БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ў 18 ТАМАХ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 6

ДАДАІЗМ
ЗАСТАВА

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), **В.С.АНОШКА, І.І.АНТАНОВІЧ, В.С.АНТАНЮК, Я.М.БАБОСАЎ, В.К.БАНДАРЧЫК, М.А.БАРЫСЕВІЧ, А.П.ВАЙТОВІЧ, І.Дз.ВАЛАТОЎСКІ, М.С.ВЫСОЦКІ, І.В.ГАЙШУН, А.М.ГАНЧАРЭНКА, Р.Г.ГАРЭЦКІ, В.М.ГУРЫН, А.М.ДАНІЛАЎ, У.П.ЗАМЯТАЛІН, В.В.ЗУЁНАК, В.А.КАВАЛЕНКА, М.П.КАСЦЮК, С.С.ЛАЎШУК, І.М.ЛУЧАНОК, Г.М.ЛЫЧ, А.В.МАЦВЕЕЎ, А.М.МІХАЛЬЧАНКА, І.Я.НАВУМЕНКА, У.М.НІЧЫПАРОВІЧ, В.Ц.ОСІПАЎ** (намеснік галоўнага рэдактара), **М.В.ПАДГАЙНЫ, А.І.ПАДЛУЖНЫ, Ю.В.ПАРТНОЎ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ** (першы намеснік галоўнага рэдактара), **М.Ф.ПІЛІПЕНКА, У.В.РУСАКЕВІЧ, А.В.САБАЛЕЎСКІ, М.А.САВІЦКІ, С.П.САМУЭЛЬ, А.Г.СЛУКА, М.С.СТАШКЕВІЧ, М.В.СТОРАЖАЎ, В.І.СТРАЖАЎ, Л.М.СУШЧЭНЯ, Г.А.ФАТЫХАВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.К.ФЯДОСАЎ** (намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар), **І.П.ХАЎРАТОВІЧ, І.П.ШАМЯКІН, В.П.ШАРАНГОВІЧ, М.М.ЯРОМЕНКА.**

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1998

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)
Б 43

НАВУКОВА-РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:

А.М.АБРАМОВІЧ, А.І.АКСЁНЕНКА, Я.Я.АЛЯКСЕЙЧЫК, М.М.АЛЯХНОВІЧ, І.П.АНТОНАЎ, П.А.АПАНАСЕВІЧ, І.В.АРЖАХОЎСКІ, Г.С.АЎСЯННІКАЎ, А.А.БОГУШ, А.І.БОЛСУН, В.І.БОЎШ, Ю.П.БРОЎКА, В.С.БУРАКОЎ, У.П.ВЯЛІЧКА, С.І.ГРЫБ, А.П.ГРЫЦКЕВІЧ, А.П.ДАСТАНКА, М.І.ДЗЯМЧУК, С.Ф.ДУБЯНЕЦКІ, М.І.ЕРМАЛОВІЧ, Р.А.ЖМОЙДЗЯК, Э.М.ЗАГАРУЛЬСКІ, М.Е.ЗАЯЦ, М.А.ІЗОБАЎ, У.В.КАВАЛЁНАК, Л.В.КАЛЕНДА, Я.Ф.КАНАПЛЯ, Ф.М.КАПУЦКІ, Л.В.КІРЫЛЕНКА, В.П.КІСЕЛЬ, П.І.КЛІМУК, У.М.КОНАН, У.С.КОШАЛЕЎ, А.В.КРАСІНСКІ, А.І.ЛЕСНІКОВІЧ, А.С.ЛІС, А.М.ЛІТВІН, І.І.ЛІШТВАН, У.Ф.ЛОГІНАЎ, Р.Ч.ЛЯНЬКЕВІЧ, З.Я.МАЖЭЙКА, М.А.МАЙЕР, А.С.МАЙХРОВІЧ, З.І.МАЛЕЙКА, А.В.МАЛЬДЗІС, Л.Я.МІНЬКО, А.Я.МІХНЕВІЧ, У.М.МІХНЮК, В.Ф.МЯДЗВЕДЗЕЎ, М.В.НІКАЛАЕЎ, С.А.НІЧЫПАРОВІЧ, В.І.ПАРФЁНАЎ, М.М.ПІКУЛІК, У.А.ПІЛІПОВІЧ, Л.Д.ПОБАЛЬ, І.М.ПТАШНІКАЎ, Л.М.РОЖЫНА, А.У.РУСЕЦКІ, А.І.РУЦКІ, В.В.СВІРЫДАЎ, І.Д.СІПАКОЎ, С.У.СКАРУЛІС, Э.М.СКОБЕЛЕЎ, Р.Б.СМОЛЬСКІ, А.А.СТРАЛЬЧОНАК, В.С.ТАНАЕЎ, У.М.ТАНАНА, У.С.УЛАШЧЫК, А.А.ФІЛІМОНАЎ, В.С.ФІЛІПОВІЧ, В.А.ФЯДОСІК, Л.У.ХАТЫЛЁВА, В.С.ЦІТОЎ, А.Р.ЦЫГАНАЎ, Ю.М.ЧУРКО, В.В.ЧЭЧАТ, І.В.ШАБЛОЎСКАЯ, В.Ф.ШМАТАЎ, А.Р.ШРУБЕКА, Г.В.ШТЫХАЎ, У.А.ШЧАРБАКОЎ, Дз.І.ШЫРАКАНАЎ, Л.У.ЯЗЫКОВІЧ, Л.Ф.ЯЎМЕНАЎ.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ:

М.Э.АБАЛА (Латвія), **Т.І.АДУЛА, Р.М.АЛАДАВА, В.А.АНТАНЕВІЧ, Г.А.АНТАНЮК, А.Ц.БАЖКО, Л.А.БАЛВАНОВІЧ, А.А.БАРШЧЭЎСКІ** (Польшча), **В.І.БЕРНІК, І.В.БОДНАР, А.М.БУЛЫКА, М.С.ВАЙТОВІЧ, Г.В.ВАЛАБУЕВА, А.І.ВАЛОЖЫН, Э.А.ВАЛЬЧУК, А.М.ВЕДЗЯНЕЕЎ, Г.У.ВЫНАЕЎ, Т.В.ГАБРУСЬ, В.С.ГАПЕНКА, С.В.ГОВІН, Л.І.ГУРСКІ, А.А.ГУСАК, Л.Н.ДРОБАЎ, М.А.ДУБІЦКІ, М.І.ЖУКАЎ, А.І.ЖУРАЎСКІ, У.Г.ЗАЛАТАГОРАЎ, Э.Р.ІОФЕ, В.А.КАДАЎБОВІЧ, Л.Р.КАЗЛОЎ, Л.В.КАЗЛОЎСКАЯ, П.Ф.КАЛІНОЎСКІ, У.К.КОРШУК, Б.А.КРАПАК, А.М.КУЛАГІН, Г.Р.КУЛЯШОВА, У.Ф.ЛАДЫСЕЎ, А.А.ЛАЗАРЭВІЧ, І.Л.ЛАПІН, А.П.ЛАПІНСКЕНЕ** (Літва), **М.В.ЛАЎРЫНОВІЧ, І.І.ЛЕАНОВІЧ, А.С.ЛЕАНЦЮК, У.К.ЛУКАШЭВІЧ, Е.А.ЛЯВОНАВА, К.Л.МАЙСЯЙЧУК, У.В.МАКАРАЎ, С.Дз.МАЛЮКОВІЧ, Л.І.НАВУМЕНКА, В.М.НАВУМЧЫК, А.І.НАРКЕВІЧ, В.Л.НАСЕВІЧ, М.Я.НІКІФАРАЎ, М.М.ПАГРАНОЎСКІ, С.А.ПАДОКШЫН, П.А.ПУПКЕВІЧ, В.П.РАГОЙША, В.У.РАДЗІВІНОЎСКІ, Л.М.РАЖАНАВА, Т.А.РАМАНАВА, Г.В.РАТНІКАЎ, Г.Ф.РЫКОЎСКІ, М.П.САВІК, У.Л.САКАЛОЎСКІ, Л.Ф.САЛАВЕЙ, Б.П.САЛАГУБІК, С.Н.САРЫНЯН** (Арменія), **Я.М.САХУТА, У.М.СЕЎРУК, Г.В.СІНІЛА, І.І.СІНЧУК, М.Ф.СПІРЫДОНАЎ, А.Я.СУПРУН, Г.Г.СЯРГЕЕВА, А.А.ТОЗІК, Ю.А.ХАРЫН, А.А.ЦІТАВЕЦ, Г.А.ЦЫХУН, В.А.ЧАБАНЕНКА** (Украіна), **А.А.ЧАЛЯДЗІНСКІ, І.А.ЧАРОТА, Г.Г.ШАНЬКО, А.С.ШАЎЧЭНКА, Л.П.ШАХОЦЬКА, С.Л.ШМАТОК, П.П.ШУБА, Я.Ф.ШУНЕЙКА, М.Р.ЮРКЕВІЧ, Я.А.ЮХО, М.Г.ЯСАВЕЕЎ.**

Мастацкае афармленне **Э.Э.ЖАКЕВІЧА, А.М.ХІЛЬКЕВІЧА**

ISBN 985-11-0106-0 (т. 6)
ISBN 985-11-0035-8

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя»
імя Петруся Броўкі, 1998

Д

ДАДАІ́ЗМ (франц. dadaïsme ад dada драўляны конік; у пераносным сэнсе — дзіцячы лепет), мадэрнісцкая літ.-маст. плынь у Зах. Еўропе ў 1916—22. Узнікла ў Цюрыху ў асяроддзі нігілістычна настроенай інтэлігенцыі, якая ўспрыняла 1-ю сусв. вайну як праяўленне ў чалавеку адвечных звярыных інстынктаў, а розум, мараль эстэтыку — толькі як іх маскіроўку. Тэарэтыкі Д. абвяшчалі поўны разрыў з літ. традыцыяй і існуючымі сац. ўстоямі («дадаісцкія маніфесты» Т.Тцара, Г.Баля, Р.Гюльзенбека). Гал. патрабаванне паэтыкі Д. — «спантаннасць», «аўтаматызм», якія выключалі разумовую дзейнасць у стварэнні тэкстаў, што па-сутнасці вяло да страты іх камунікатыўнасці. Дадаісты практыкавалі змяшэнне стылістычна несумяшчальных фрагментаў розных тэкстаў (а таксама ўключэнне ўжо гатовага тэксту), бязладнае гука- і шумаперайманне («бруізм»), эксперыменты са стварэннем «мудрагелістай» мовы, насуперак агульнапрынятым нормам. Большасць літ. тэкстаў паслядоўнікаў Д. так і засталіся на ўзроўні эксперыментаў, аднак найб. вядомыя паэты выйшлі за рамкі нігілістычных дэкларацый і стварылі шэраг значных твораў, што прадвызначылі паэтыку *сюррэалізму* (зб. «Магнітныя палі» А.Брэтона і Ф.Супо, «Жывёлы і іх людзі, людзі і іх жывёлы» П.Элюара, «Феерверк» Л.Арагона і інш.). Праграмны ірацыяналізм і дэманстратыўны антыэстэтызм характэрны і для мастакоў-дадаістаў (французы М.Дзюшан, М.Эрнст, Ф.Пікабія, швейцарац Г.Арп, немец К.Швітэрс і інш.). Іх метады зводзіліся да бессэнсоўных каракуляў (падобных на дзіцячы малюнак), псеўдатэхн. чарцяжоў, камбінацый выпадковых прадметаў, наклеек на палатно і да т.п. У 1920-я г. ў Францыі Д. зліўся з сюррэалізмам, у Германіі — з *экспрэсіянізмам*. Некаторыя ням. дадаісты выкарыстоўвалі прыёмы вулічнага малюнка (сатыр. графіка Ж.Гроса) ці мантажу (паліт. плакаты Дж.Гартфілда). Дадаісцкія метады камбінавання «гатовых» прадметаў у сярэдзіне 20 ст. далі пачатак *поп-арту*.

Да арт. **Дадаізм**. М.Э р н с т. П'ета, або Рэвалюцыйная ноч. 1923.

Да арт. **Дадаізм**. Г.А р п. Дошка з яйкамі. 1922.

Літ.: К а п т е р е в а Т. Дадаизм и сюрреализм // Модернизм. 3 изд. М., 1980.

К.М.Міхееў (дадаізм у літаратуры).

ДАДА́НЫ СКАЗ, прэдыкатыўная частка *складаназалежнага сказа*, якая сінтаксічна падпарадкавана гал. частцы. Фармальным паказчыкам сінтаксічнага падпарадкавання даданай часткі служаць *злучнікі* і злучальныя словы. Яны парознаму ўваходзяць у яе структуру і ў пэўнай меры кваліфікуюць яе значэнне.

У лінгвістычнай л-ры не існуе адзінай класіфікацыі даданых частак. Часцей за ўсё яны ў залежнасці ад спосабу сувязі і характару адносін з гал. часткай падзяляюцца на прыфразныя і прыслоўныя. Прыфразныя часткі прымацаваны слабай сувяззю да гал. часткі, бо адносяцца да ўсяго яе зместу і не прадвызначаюцца яе будовай. Сярод іх вылучаюцца даданыя часу, месца, прычыны, мэты, умовы, уступальныя, выніковыя, параўнальныя, далучальныя. Прыслоўныя часткі адрозніваюцца цеснай сувяззю з гал. часткай, бо адносяцца да асобных яе слоў і служаць для іх удакладнення і канкрэтызацыі. Сярод іх вылучаюцца даданыя азначальныя, дапаўняльныя, дзейнікавыя, выказнікавыя, спосабу дзеяння, меры і ступені.

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 2. Мн., 1986.

Л.І.Бурак.

ДАДА́НЫЯ ЧЛЕ́НЫ СКА́ЗА, залежныя сінтаксічныя адзінкі, якія маюць форму слова ці словазлучэння і развіваюць структурную аснову (прэдыкатыўнае ядро) сказа. Знаходзяцца ў падпарадкавальнай сувязі з *галоўнымі членамі сказа* або інш. членамі сказа і ўдакладняюць, дапаўняюць ці паясняюць іх. У сказе яны рэалізуюць і абагульняюць атрыбутыўныя, аб'ектыўныя і акалічнасныя адносіны. У залежнасці ад характару гэтых адносін Д.ч.с. ў бел. мове па традыцыі падзяляюцца на *азначэнні* («Настала **ранняя** вясна»), *дапаўненні* («Вецер калыша **збажыну**») і *акалічнасці* («**У нагах** трава **нізка** сцелецца»).

У бел. мове адзін і той жа Д.ч.с. можа сумяшчаць у сабе атрыбутыўнае і аб'ектыўнае або атрыбутыўнае і акалічнаснае ці аб'ектнае і акалічнаснае значэнні, а г.зн., што паміж названымі Д.ч.с. не існуе выразнай мяжы. Традыц. класіфікацыя іх некалькі схематычная, не зусім дакладная, бо не ўлічвае пераходных з'яў паміж Д.ч.с. і той ролі, якую кожны з іх адыгрывае ў структурнай арганізацыі сказа. Вядуцца пошукі больш дакладнай класіфікацыі Д.ч.с.

Л.І.Бурак.

ДАДАТКО́ВАЕ РАССЛЕ́ДАВАННЕ, у крымінальным працэсе Рэспублікі Беларусь і некаторых краін СНД дадатковае *следства* або *дазнанне*, якое праводзіцца паводле распараджэння пракурора ці вызначэння суда па крымінальнай справе, скончанай следствам. Право-

дзіцца ў выпадках: выяўлення пракурорам або судом непаўнаты папярэдняга следства, якая не можа быць папоўнена ў суд. пасяджэнні; істотнага парушэння органамі следства ці дазнання закону, якое перашкаджае разгляду справы судом; наяўнасці падстаў для прад'яўлення абвінавачанаму інш. абвінавачання, звязанага з раней прад'яўленым; для змянення абвінавачання на больш цяжкае або на такое, якое істотна адрозніваецца ад абвінавачання, што ўтрымліваецца ў абвінаваўчым заключэнні; наяўнасці падстаў для прыцягнення да крымін. адказнасці па гэтай справе інш. асоб і інш. падстаў, прадугледжаных заканадаўствам. Указанні пракурора і суда аб Д.р. абавязковыя для следчых і інш. дзярж. органаў, грамадскіх арг-цый і грамадзян. *С.У.Скаруліс.*

ДАДА́ТНЫ ЛІК, рэчаісны лік, большы за нуль, напр. 1, 2, 6, 5. На лікавай восі адлюстроўваецца пунктамі, размешчанымі ўправа ад пачатку адліку (ад нуля). Гл. таксама *Адмоўны лік.*

ДАДА́ШАЎ Садых Алекпер аглы (15.4.1905, Баку — 24.12.1946), азербайджанскі архітэктар. Акад. АН Азербайджана (1945), засл. дз. маст. Азербайджана (1940). Скончыў Азерб. політэхн. ін-т у Баку (1929). Асн. творы ў Баку (разам з М.А.Усейнавым): кінатэатр «Нізамі» (1934), Мін-ва харч. прам-сці і кансерваторыя (абедзве 1937—39), Музей Нізамі (1930—40-я г.). Дзярж. прэмія СССР 1941.

ДАДАЯ́Н Аляксандр Арсенавіч (н. 24.5.1925, с. Хот Гарыскага р-на, Арменія), бел. матэматык. Канд. фізіка-матэм. н. (1965), праф. (1983). Скончыў Азерб. ун-т (1955). З 1966 у Бел. пед. ун-це. Навук. працы па тэнзарным аналізе і рыманавай геаметрыі. Аўтар навуч. дапаможнікаў для тэхнікумаў і ВНУ.

Тв.: Алгебра и геометрия. Мн., 1989 (разам з У.А.Дударэнкам); Математический анализ. Мн., 1990 (з ім жа).

ДАДЗІЁМАВА Вольга Уладзіміраўна (н. 5.8.1955, г. Гомель), бел. гісторык музыкі. Канд. мастацтвазнаўства (1990). Дачка У.*Дадзіёмава.* Скончыла Бел. кансерваторыю (1978). З 1978 у Мінскім ін-це культуры, з 1993 дацэнт Бел. акадэміі музыкі. Даследуе гісторыю муз. культуры Беларусі 17—19 ст. Аўтар манаграфіі «Музычная культура гарадоў Беларусі ў XVIII ст.» (1992), навуч. дапаможніка «Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.» (1994), брашуры «Восіп Казлоўскі» (1995), укладальнік рэпертуарных зб. «Інструментальная музыка Беларусі XVIII ст.» (1990; 1991, і аўтар уступнага арт.), зб. «Помнікі музычнай культуры Беларусі» (1995, вып. 2) і інш. Выявіла больш за 50 помнікаў айч. муз. мастацтва, у т.л. оперу «Агатка, ці Прыезд пана» Я.Д.Голанда на либр. М. Радзівіла. З 1995 аўтар і вядучая цыкла перадач «Галасы мінуўшчыны» Бел. тэлебачання.

ДАДЗІЁМАЎ Уладзімір Ільіч (8.1.1924, мяст. Навабеліца, цяпер у межах Гомеля — 25.11.1983), бел. пісьменнік. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1958). Працаваў у прэсе, на Бел. радыё. У 1959—64 уласны карэспандэнт «Литературной газеты». Друкаваўся з 1943. Аўтар рамана пра жыццё рабочых-тэкстыльшчыкаў «Над Нёманам» (1955, новая рэд. 1957), дакумент. аповесці пра будаўнікоў Бярозаўскай ДРЭС «Белазерскі дзённік» (1963), нарысаў.

ДАДО́МА (Dodoma), горад, сталіца Танзаніі. Адм. ц. вобласці Дадома. Горад узнік у пач. 20 ст. на месцы вёскі. Урадавае рашэнне аб пераносе сталіцы з Дар-эс-Салама прынята ў 1973. 1,8 млн. ж. з прыгарадамі (1990). Чыг. станцыя. Вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: харчасмакавая (вытв-сць він, фруктовых кансерваў, касторавага алею і інш.), тэкст., дрэваапр., керамічная, паліграф., буд. матэрыялаў. Перапрацоўка с.-г. прадукцыі (кавы, бавоўны, сізалю, гваздзікі і інш.). Геал. музей.

А.М.Дадышкіліяні.

ДАДЫШКІЛІЯ́НІ Атар Міхайлавіч (н. 21.8.1923, г. Новачаркаск, Расія), балетмайстар і оперны рэжысёр. Засл. арт. Расіі (1961). Засл. дз. маст. Беларусі (1970). Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1955). З 1955 балетмайстар у розных т-рах Расіі. З 1965 гал. балетмайстар, у 1972—76 гал. рэжысёр Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. З 1976 гал. рэжысёр Ніжагародскага т-ра оперы і балета. Д.-балетмайстру ўласцівы сцвярджэнне рэаліст. вобразнасці, пошукі ў галіне сцэн. формы. Актыўна супрацоўнічаў з бел. кампазітарамі. Першы пастаноўшчык балетаў «Альпійская балада» (1967), «Выбранніца» (1969), «Тыль Уленшпігель» (1974) Я.Глебава, «Пасля балю» Г.Вагнера (1971). Сярод інш. пастановак на бел. сцэне: балеты «Спартак» А.Хачатурана (1964), «Пер Гюнт» на муз. Э.Грыга (1966), «Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева (1968), оперы «Хаваншчына» М.Мусаргскага (1970), «Пікавая дама» (1972) і «Іаланта» (1975) П.Чайкоўскага, «Дон Жуан» В.А.Моцарта (1973), «Русалка» А.Даргамыжскага (1974). У Ніжагародскім т-ры паставіў балет «Маленькі прынц» Глебава (1982). *А.І.Калядзенка.*

ДАДЫШКІЛІЯ́НІ Натэла Атараўна (н. 2.12.1960, г. Чэлябінск, Расія), артыстка бел. балета. Засл. арт. Беларусі (1990). Дачка А.*Дадышкіліяні.* Скончыла Бел. харэаграфічнае вучылішча (1979). З 1979 салістка Нац. акад. т-ра балета Беларусі. Танцоўшчыца класічнага плана. Найб. блізкія ёй партыі ў пастаноўках В.Елізар'ева: Фрыгія («Спартак» А.Хачатурана), Ева («Стварэнне свету» А.Пятрова), Джульета («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Каханая («Карміна Бурана» на муз. К.Орфа), Дзева-выбранніца («Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага). Сярод інш. партый: Маша, Адэта—Адылія, фея Бэзу і Блакітная птушка («Шчаўкунок», «Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Сільфіда («Сільфіда» Х.Левенскольда), Марыя («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Уладарка дрыяд («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Дзяўчына («Шапэніяна» на муз. Ф.Шапэна), Магнолія («Чыпаліна» К.Хачатурана).

Літ.: Чурко Ю.М. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988. С. 151—156. *А.І.Калядзенка.*

ДАДЫЯ́НІ Шалва Мікалаевіч (21.5.1874, г. Зестафоні, Грузія — 15.3.1959), грузінскі пісьменнік і тэатр. дзеяч. Нар. арт. Грузіі (1923). У 1893—1923 акцёр і рэжысёр (з 1907) Кутаіскага груз. драм. т-ра. Літ. дзейнасць пачаў як паэт (зб. «Іскра», 1892). Пісаў драм. творы, апавяданні. Сярод п'ес: «У падзямеллі» (1905), «Калі яны балявалі» (1907), «Гегечкоры» (1915), «Учарашнія» (1916). Аўтар першай у груз. л-ры сатыр. камедыі «У самае сэрца» (1928), аптыміст. трагедыі «Тэтнульд» (1931), гіст. раманаў «Юрый Багалюбскі» (1927), «Сям'я Гвіргвіліяні» (1945—54) і інш.

ДАДЭ́ (Daudet) Альфонс (13.5.1840, г. Нім, Францыя — 16.12.1897), французскі пісьменнік. Ураджэнец Праванса, ён ужо ў першых творах, якія зрабілі яго імя вядомым (зб. вершаў «Закаханыя», 1858; аўтабіягр. раман «Малы», 1868; зб. апавяданняў і нарысаў «Пісьмы з майго млына», 1869), з тонкім лірызмам і мяккім гумарам расказаў пра побыт, норавы, звычаі, паданні сваіх землякоў, з любоўю намаляваў вобраз «маленькага чалавека». На правансальскім матэрыяле напісана і вядомая сатыр. трылогія пра Тартарэна («Незвычайныя прыгоды Тартарэна з Тараскона», 1872; «Тартарэн у Альпах», 1885; «Порт Тараскон», 1890). У вобразе гал. героя ён высмеяў дробнага буржуа, правінцыяльнага абывацеля, фразёра і хвалько. У сац. раманах 1870—80-х г. з гіст. і амаль дакументальнай канкрэтнасцю, паказаў сучасную яму Францыю, стварыў трапныя сатыр. вобразы драпежных дзялкоў і паліт. авантурыстаў («Фрамон малодшы і Рыслер старэйшы», 1874; «Набоб», 1877; «Каралі ў выгнанні», 1879), прадажных журналістаў і рэліг. фанатыкаў («Нума Руместан», 1881; «Евангелістыка», 1883), бяздарных артыстаў і лжэвучоных («Сафо», 1884; «Бессмяротны», 1885). Аўтар п'ес («Арлезіянка», 1872, і інш.), успамінаў.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—7. М., 1965.

Літ.: История всемирной литературы. Т. 7. М., 1990. *Т.У.Кавалёва.*

ДАДЭКАНЕ́С, астравы ў Эгейскім м., гл. *Спарады Паўднёвыя*.

ДАДЭКАФО́НІЯ (ад грэч. dōdeka дванаццаць + phōnē гук), адзін з відаў кампазітарскай тэхнікі 20 ст.; метад стварэння музыкі, пры якім уся тканіна твора выводзіцца з серыі — своеасаблівага арганізаваных 12 (часам і менш) гукаў храматычнай *гамы*. Узнікла на аснове т. зв. свабоднай *атанальнасці*. Эстэтычны сэнс выкарыстання Д. — дасягненне канструкцыйнага адзінства і лагічнай звязнасці пры адсутнасці класічных танальных адносін (гл. *Мажор-мінор*). Метад серыйнай Д. распрацаваны А.*Шонбергам* (1921), удасканалены А.*Вебернам* і А.*Бергам*. Серыя мае 4 формы: першапачатковую, або прыму, ракаход (тоны ідуць у адваротным парадку), інверсію (інтэрвалы серыі дадзены ў абярненні), ракаходную інверсію. Кожная форма можа быць пачата з любога з 12 тонаў тэмпераванай сістэмы, у выніку атрымліваецца 48 раўназначных серыйных радоў. Серыя можа выкладацца гарызантальна, утвараючы меладычную лінію, вертыкальна, утвараючы акордыку, або ў розных камбінацыях рухаў. Вядомы разнавіднасці дадэкафоннай тэхнікі І.М.Гаўэра, А.Габы, Э.Кшэнека. Да Д. звяртаюцца многія сучасныя кампазітары, часта фрагментарна ў рамках танальна арганізаванай музыкі, у т.л. бел. В.Войцік, Г.Гарэлава, А.Гураў, У.Дарохін, У.Кандрусевіч, В.Капыцько, С.Картэс, В.Кузняцоў, А.Літвіноўскі, Дз.Смольскі, А.Сонін, Р.Сурус і інш.

Літ.: Денисов Э. Додекафония и проблемы современной композиторской техники // Музыка и современность. М., 1969. Вып. 6; Когоутек Ц. Техника композиции в музыке XX в.: Пер. с чеш. М., 1976; Холопов Ю. Кто изобрел 12-тоновую технику? // Проблемы истории австро-немецкой музыки. М., 1983; Ягож. Гармония. М., 1988.

Т.Г.Мдывані.

ДАДЭКА́ЭДР (ад грэч. dōdeka дванаццаць + hedra грань), адзін з пяці тыпаў правільных шматграннікаў. Мае 12 граней (пяцівугольных), 30 рэбраў, 20 вяршынь (у кожнай вяршыні сыходзяцца 3 рабры). Калі a — даўжыня рабра Д., тады яго аб'ём $v = \frac{a^3}{4}(15 + 7\sqrt{5}) \approx 7{,}6631\ a^3$. Упершыню Д. пабудаваў Тэатэт (4 ст. да н.э.).

ДАЕ́ННЕ, працэс атрымання малака ад с.-г. жывёл (кароў, коз, авечак, кабыл і інш.). Малако ў вымі лактуючай жывёлы ўтвараецца бесперапынна і да пачатку чарговага Д. запаўняе альвеалярны і цыстэрнавы аддзелы, адкуль яго атрымліваюць дзякуючы рэфлексу малакааддачы, які стымулюецца абмываннем, выціраннем, масажам вымя. Дояць кароў машынным (гл. *Даільная ўстаноўка, Даільны апарат*) або ручным спосабам. Найб. спрыяльныя ўмовы для выдалення малака з вымя стварае машыннае Д.: адначасова выдойваюцца 4 долі вымя, павышаецца прадукцыйнасць працы, малако не забруджваецца. Звычайна карову дояць 2—3 разы на дзень. Ручным спосабам дояць авечак (1—2 разы ў суткі), коз малочных парод (2 разы).

ДАЁНКА, у беларусаў бандарная пасудзіна на 6—10 л, крыху расшыраная ў верхняй частцы. Выкарыстоўвалася для даення кароў. Рабілі Д. з хваёвых, радзей з дубовых ці кляновых клёпак. Адна падоўжаная клёпка ўтварала ручку, у клёпцы насупраць рабілі літок (рыльца). Для даення кароў у полі выкарыстоўвалі Д. з почапкай.

ДАЖБО́Г, язычніцкае бажаство ўсх. славян, бог сонца і агню; пазней бог земляробства, урадлівасці, дабрабыту. Сын *Сварога*. У Кіеўскай Русі Д. пакланяліся (яго ідал быў пастаўлены побач з *Перуном* і інш. багамі на капішчы за церамным дваром у Кіеве). Як сімвалічны вобраз трапляецца ў стараж.-рус. л-ры (першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 980). У «Слове аб палку Ігаравым» Д. выступае як продак і апякун Русі і стараж.-рус. народа.



Дадэкаэдр.

ДАЖДЖАВА́ЛЬНЫЯ МАШЫ́НЫ І ЎСТАНО́ЎКІ. Прызначаны для паліванне *дажджаваннем* с.-г. культур. Рабочыя органы — кароткаструменныя (5—8 м) насадкі (ствараюць веерападобны паток вады), сярэднеструменныя (10—35 м) і далёкаструменныя (40—80 м і болей) дажджавальныя апараты (ДА; забяспечваюць дажджаванне па крузе або сектары; бываюць каромыславыя, рэактыўныя, турбінныя, імпульсныя і бесперапыннага дзеяння і інш.).

Дажджавальныя машыны маюць аўтаномны рухавік або прывод, трансмісію і хадавую частку. Бываюць шматапорныя (7 і болей апор з рознымі хадавымі часткамі) тыпу «Фрэгат», «Днепр» і шыроказахопныя (шыр. захопу 300—800 м) тыпу «Валжанка» (сярэднеструменныя); двухкансольныя тыпу ДДА-100 МА (фермы, змацаваныя на трактары; маюць помпавую ўстаноўку з прыводам ад вала трактара; кароткаструменныя); навясныя на трактар тыпу ДДН-100 (маюць помпу-рэдуктар, змацаваны на раме; далёкаструменныя). Адрозніваюць дажджавальныя машыны, якія робяць паліў адначасова з рухам і пазіцыйна (пры нерухомай машыне). Дажджавальныя ўстаноўкі бываюць разборныя пераносныя (манціруюцца з асобных звёнаў, перад зменай пазіцыі яны разбіраюцца і пераносяцца на новае месца) і неразборныя (перамяшчаюцца цалкам на прычэпе трактара). Аснашчаюцца сярэднеабо далёкаструменнымі ДА, працуюць пазіцыйна. Найб. пашыраны камплекты ірыгацыйнага абсталявання «Вясёлка», дажджавальныя шлейфы ДШ-25/300 і інш. Стацыянарныя дажджавальныя сістэмы — укладзеныя пад ворны слой напорныя трубаправоды з гідрантамі, што выходзяць на паверхню. Да іх падключаюцца далёка- або сярэднеструменныя ДА. Вада ў трубаправодную сетку падаецца помпавай станцыяй. Паўстацыянарныя даж-



1



2



3

Дажджавальныя машыны і ўстаноўкі: 1 — сярэднеструменная машына «Фрэгат»; 2 — далёкаструменная машына ДДН-100; кароткаструменная ўстаноўка — дажджавальны шлейф ДШ-25/300.

Даёнка.

джавальныя сістэмы найб. пашыраныя, у іх магістральны і размеркавальны трубаправоды стацыянарныя, а дажджавальныя машыны перамяшчаюцца па арашальнай плошчы.

Літ.: Сапунков А.П. Применение дождевальной техники. М., 1991. *А.Я.Вакар.*

ДАЖДЖАВА́ННЕ, спосаб паліву с.-г. культур, пры якім вада распырскваецца *дажджавальнымі машынамі* і *ўстаноўкамі*. Увільгатняе глебу, прыземны слой паветра і наземную ч. раслін. Крыніцамі вады для паліву з'яўляюцца рэкі, сажалкі, каналы і інш. Выкарыстоўваецца пры вырошчванні с.-г. культур у зоне няўстойлівага ўвільгатнення. На Беларусі Д. — асн. спосаб паліву шматгадовых траў, культ. пашы і ўчасткаў пад агароднінными культурамі (пл. 115 тыс. га; 1995). Выкарыстоўваюцца дажджавальныя машыны «Валжанка», «Фрэгат», «Днепр», ДДН-70 і інш. Гл. таксама *Арашэнне*.



Да арт. **Дажджавальныя машыны і ўстаноўкі**. Дажджавальныя апараты: *а* — кароткаструменная дэфлектарная насадка (1 — варонка, 2 — дэфлектар); *б*, *в* — сярэднеструменныя, *г* — далёкаструменны апараты (1 — дапаможныя соплы, 2 — ствол, 3 — асноўнае сапло, 4 — турбінка).

ДАЖДЖАВІ́К (Lycoperdon), род базідыяльных грыбоў-гастэраміцэтаў парадку *дажджавіковых*. Каля 50 відаў. Пашыраны па ўсім зямным шары. На Беларусі найб. вядомыя Д. жамчужны, або шыпаваты, ці сапраўдны (L. perlatum), Д. грушападобны (L. pyriforme), таксама адзначаны Д. маленькі (L. pusillum), Д. імшысты (L. muscorum), Д. вожыкападобна-калючы (L. echinatum). Ядомыя ў маладым узросце.

Дажджавік жамчужны.

Пладовыя целы шара-, груша-, галоўчатападобныя, сядзячыя або з несапраўднай ножкай, з белымі ніткамі міцэлію каля асновы, дыям. 1—20 см. Абалонка (перыдый) 2-слаёвая. Вонкавы слой шыпаваты, ігольчасты, дробнабародаўчаты, лёгка ападае, унутраны — буры, падобны на паперу. Глеба (мякаць) белая, мяккая, пры выспяванні бледнаваліўкавая, парашкаватая. Споры шарападобныя, гладкія або бародаўчатыя, часам з доўгімі прыдаткамі.

ДАЖДЖАВІКО́ВЫЯ (Lycoperdales), парадак грыбоў-гастэраміцэтаў. Каля 270 відаў. Пашыраны па ўсім зямным шары. На Беларусі больш за 20 відаў з родаў *галавач*, *дажджавік*, зорачнік, міцэнаструм, лангерманія, *порхаўка*. Глебавыя сапратрофы. Растуць на лугах, пашах, у лясах. Некат. ядомыя ў маладым узросце. У Д. пладовыя целы ўнутры жоўтыя і бурыя ў адрозненне ад неядомых псеўдадажджавікоў, у якіх з узростам яны робяцца чорнымі або фіялетавымі.

Пладовыя целы наземныя, сядзячыя або з ножкай, шара-, груша-, зоркападобныя і інш. Перыдый (абалонка) 1—4-слаёвы, пераважна мяккі з 1 ці некалькімі адтулінамі ў стадыі спеласці, з узростам разрываецца. Глеба (мякаць) мяккая, з камер і пласцін трамы, потым парашкападобная, з капіліцыем (ніткі для разрыхлення спор). Споры шарападобныя, сеткаватыя або шыпаватыя, цёмныя.

ДАЖДЖАВЫ́Я ЧЭ́РВІ, земляныя чэрві, агульная назва 5 сям. кольчатых чарвей кл. алігахетаў, або малашчынкавых кальчацоў. Каля 1500 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды. Жывуць у глебе, подсціле, буйныя віды рыюць хады глыб. да 8 м. На Беларусі 13 відаў, найб. пашыраны пашавы чарвяк (Nicodrilus caliginosus), малы чырвоны чарвяк, або малы выпаўзак (Lumbricus rubellus), эйзеніела чатырохгранная (Eiseniella tetraedra), гнаявы чарвяк (Eisenia foetida), вял. чырвоны выпаўзак (Lumbricus terrestris) і інш.

Даўж. 2 см — 3 м (Eisenia magnifica), шыр. да 20 мм. Цела цыліндрычнае, крыху сплюснутае або чатырохграннае, светла-шэрае, зялёнае, вішнёва-чырвонае, чорна-бурае. Складаецца з 60—450 члеников (сегментаў), на кожным з іх (акрамя першага) ад 8 да некалькіх дзесяткаў шчацінак, што дапамагаюць пры поўзанні і ўтрыманні ў нары. На пярэднім канцы цела паясок, што выдзяляе рэчыва, якое склейвае 2 асобіны пры спароўванні і ўтварае яйцавы кокан. Добра развітыя нерв., крывяносная, стрававальная, выдзяляльная і палавая сістэмы, органы дотыку, нюху, здольнасць да *рэгенерацыі*. Дыхаюць скурай. Гермафрадыты. Актыўныя ноччу, днём выпаўзаюць з зямлі толькі пасля дажджу (адсюль назва). *Сапрафагі*. Жывяцца пераважна рэшткамі раслін. Рыхляць і ўзбагачаюць глебу мінер. рэчывамі, надаюць ёй устойлівую дробна-камякаватую структуру, спрыяюць аэрацыі і ўвільгатненню. Некаторыя — гаспадары ўзбуджальнікаў гельмінтозаў жывёл і чалавека.

Дажджавыя чэрві: 1 — вялікі чырвоны выпаўзак; 2 — малы чырвоны; 3 — гнаявы; 4 — эйзеніела чатырохгранная.

ДАЖДЖО́ЎКІ (Haematopota), род двухкрылых насякомых сям. сляпнёў. Каля 400 відаў. Пераважна ў Афрыцы і Еўразіі. Пашыраны на вільготных лугах. У адрозненне ад інш. сляпнёў лётаюць і ў пахмурнае надвор'е, асабліва перад дажджом. На Беларусі 4 віды, найб. вядомая Д. звычайная (H. pluvialis).

Даўж. 6—13 мм. Ад інш. сляпнёў адрозніваюцца мармуровым малюнкам крылаў. Крывасмокі, нападаюць на чалавека і жывёл. Прысутнасць іх выяўляюць пасля праколу скуры хабаткоў. Лічынкі развіваюцца ў вільготнай глебе, у глеі прыбярэжных частак прэсных вадаёмаў, лісцевым подсціле. Пераносчыкі ўзбуджальнікаў сібірскай язвы, тулярэміі, трыпанасом, патагенных для с.-г. жывёл.

ДАЖЫ́НКІ, старадаўняе нар. свята ў беларусаў, звязанае з заканчэннем жніва. Дажынкавыя абрады былі скіраваны на тое, каб аддзякаваць «духам нівы» за хлеб, захаваць яе плён на наступны год. Дажаўшы жыта, жнеі ўпрыгожвалі апошні сноп кветкамі і стужкамі, плялі вянкі з каласоў і кветак і з песнямі ішлі ў вёску. Зайшоўшы ў двор, яны перадавалі апошні сноп гаспадару, які запрашаў іх за гасцінны стол з абавязковымі абрадавымі стравамі — блінамі з маслам і сытой, крупяной кашай. Усе абрады суправаджаліся дажынкавымі песнямі: іх спявалі ў канцы жніва, у час абраду *«завівання барады»*, па дарозе жней дахаты, у дварах гаспадара і на святочным застоллі. На Пн Беларусі Д. спраўлялі двойчы: малыя пасля заканчэння жытняга жніва, вялікія пасля таго, як зжыналіся і яравыя. У наш час Д. адзначаюць як *свята ўраджаю*. *А.С.Ліс.*

ДАЗА́ТАР, прыстасаванне для адмервання (дазіравання) зададзеных масы або аб'ёму вадкіх ці сыпкіх матэрыялаў. Бываюць вагавыя (адмерваюць па масе) і аб'ёмныя (па аб'ёме), перыядычнага (дыскрэтнага) і бесперапыннага дзеяння, адна- і шматкампанентныя (з паслядоўным дазіраваннем некалькіх матэрыялаў), з ручным і аўтам. кіраваннем.

Д. перыяд. дзеяння звычайна маюць бункерную кампаноўку, выкарыстоўваюцца ў тэхнал. працэсах з верт. размяшчэннем абсталявання. Д. бесперапыннага дзеяння — бункернага і стужачнага тыпаў, выкарыстоўваюцца ў працэсах з гарыз. размяшчэннем абсталявання і канвеерным транспартаваннем матэрыялаў. Аб'ёмныя і аб'ёмна-вагавыя Д. робяць у выглядзе карэтачнай, стужачнай, пласціністай або вібрацыйнай сістэмы (напр., у асфальтазмешвальных установуках). Д. выкарыстоўваюць у вытв-сці буд. матэрыялаў, у

металургіі, хім., харч. і фармацэўтычнай прам-сці, на транспарце, у гандлі і інш.

І.І.Леановіч.

ДАЗІМЕТРЫ́ЧНЫЯ ПРЫЛА́ДЫ, сістэмы, установкі і прылады для рэгістрацыі і вымярэння *іанізавальных выпрамяненняў* і актыўнасці іх крыніц. Маюць дэтэктар (паглынае энергію выпрамянення; гл. *Дэтэктары ядзерных выпрамяненняў*), вымяральнае прыстасаванне (вымярае велічыню радыяцыйных эфектаў) і выхадную прыладу (стрэлачныя прылады, самапісцы, эл.-мех. лічыльнікі, гукавыя ці светлавыя сігналізатары і інш.). У залежнасці ад віду кантролю падзяляюць на 6 груп.

Да 1-й групы адносяць прылады для вымярэння магутнасці дозы рэнтгенаўскага γ-выпрамянення і патокаў нейтронаў з дапамогай іанізацыйных камер або сцынцыляцыйных дэтэктараў, да 2-й — прылады для вымярэння патокаў α- і β-часціц з забруджаных паверхняў з дапамогай сцынцыляцыйных дэтэктараў, прапарцыянальных лічыльнікаў з паветр. запаўненнем (α-часціцы) і β-лічыльнікаў, да 3-й — установкі для вымярэння забруджанасці паветра актыўнымі газамі, аэразолямі і інш. з дапамогай іанізацыйных камер, да 4-й — радыеметрычныя ўстаноўкі для вымярэння абсалютнай актыўнасці проб вады і прадуктаў харчавання з дапамогай газанапоўненых і сцынцыляцыйных дэтэктараў, да 5-й — апаратура для вымярэння індывідуальных доз γ-выпрамянення і нейтронаў з дапамогай касет з фотаплёнкамі або малых іанізацыйных камер, да 6-й — установкі, якія маюць вял. сцынцыляцыйныя дэтэктары, для вымярэння натуральнага γ-выпрамянення чалавека, вызначэння наяўнасці β- і γ-актыўных рэчываў. Многія тыпы Д.п. выпускаюць прадпрыемствы Беларусі.

А.В.Берастаў.

ДАЗІМЕ́ТРЫЯ (ад *доза* + *...метрыя*), раздзел прыкладной ядз. фізікі, які займаецца вымярэннем і вывучэннем *іанізавальных выпрамяненняў* і эфектаў узаемадзеяння іх з рэчывам. На аснове рэгістрацыі выпрамянення метадамі Д. атрымліваюць таксама інфармацыю аб крыніцах выпрамянення, іх ізатопным складзе і размеркаванні ў прасторы, апраменены целе. Тэхн. сродкамі Д. з'яўляюцца *дазіметрычныя прылады* (дазіметры).

Пачала развівацца ў сувязі з неабходнасцю стварэння радыяцыйнай бяспекі чалавека, потым набыла важнае значэнне ў фіз., хім. і радыебіял. даследаваннях, радыяцыйнай тэхналогіі, ахове навакольнага асяроддзя. Раздзел Д., звязаны з вызначэннем эквівалентнай дозы выпрамянення, наз. эквідазіметрыяй; метады вымярэння актыўнасці радыеактыўных крыніц складаюць аснову радыеметрыі; даследаванні біял. ўздзеяння іанізавальных выпрамяненняў на клетачным і малекулярным узроўнях выклікалі ў 1960-я г. інтэнсіўнае развіццё мікрадазіметрыі, якая займаецца пытаннямі мікраскапічнага размеркавання энергіі пры ўзаемадзеянні выпрамянення з рэчывам. Гл. таксама *Дозы выпрамянення.*

А.В.Берастаў.

ДАЗНА́ННЕ, адна з формаў папярэдняга расследавання крымін. злачынстваў і правапарушэнняў. У праве Рэспублікі Беларусь і некаторых краін СНД ажыццяўляецца міліцыяй і інш. правамоцнымі органамі (дзярж. бяспекі, пажарнага нагляду, пагранічнай аховы, мытні і інш.). Адрозніваюць 2 віды Д.: па справах, папярэдняе следства па якіх абавязковае, і па справах, дзе яно не абавязковае. У першым выпадку орган дазнання ўзбуджае крымін. справу, праводзіць неадкладныя следчыя дзеянні па выяўленні слядоў злачынства і перадае справу следчаму. У другім Д. ўключае поўнае расследаванне справы; пры гэтым матэрыялы Д. з'яўляюцца падставай для разгляду справы ў судзе.

С.У.Скаруліс.

ДАЗО́Р, у сухапутных войсках орган разведкі або паходнай аховы, які высылаецца ад падраздзялення і часцей з мэтай здабыць звесткі аб праціўніку, мясцовасці, радыяцыйным і хім. стане, не дапусціць раптоўнага нападу на ахоўваемыя войскі. Склад Д. залежыць ад пастаўленых перад ім задач і умоў мясцовасці. Можа быць пешы або механізаваны, звычайна не больш за ўзвод, забяспечаны неабходнай зброяй і тэхнікай.

ДАЗО́РАЦ Юлія Львоўна (5.5.1912, г. Умань, Украіна), бел. вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1968), праф. (1969). Скончыла Адэскі мед. ін-т (1938). У 1954—73 у Віцебскім мед. ін-це. Навук. працы па праблемах эндакрыналогіі, рэўматалогіі і гепаталогіі.

ДАЗО́РЦАВА Гнэся Львоўна (31.12.1901, г.п. Карма Гомельскай вобл. — 14.8.1966), бел. вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р мед. н. (1945), праф. (1946). Скончыла БДУ (1927). У 1931—34 дырэктар, у 1954—58 навук. кіраўнік Бел. НДІ аховы маці рынства і дзяцінства. Навук. працы па біял. і біяхім. фактары і функцыян. дыягностыку хвароб жаночых палавых органаў.

Тв.: Функциональная диагностика в акушерстве и гинекологии на основе цитологических исследований. Мн., 1952.

Да арт. **Дазоршчыкі**. Дазоршчык-імператар.

ДАЗО́РШЧЫКІ (Anax), род стракоз сям. каромыслаў. Да 10 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы. Жывуць на берагах стаячых і слабапраточных вадаёмаў. На Беларусі 1 від — Д.-імператар (A. imperator), зарэгістраваны на Нарачанскіх і Браслаўскіх азёрах; занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. цела да 80 мм, крыла да 51 мм. Грудзі зялёныя, брушка ў самцоў светла-сіняе, зверху з шырокай чорнай падоўжнай паласой; у самак брушка зялёнае з бурай паласой. Вочы на некат. адлегласці датыкаюцца. Лічынкі развіваюцца ў стаячых і праточных вадаёмах.

ДАІ́ЛЬНАЯ ЎСТАНО́ЎКА, комплекс машын, апаратаў і абсталявання для мех. *даення* кароў і першаснай апрацоўкі малака. Складаюць паточную паўаўтам. лінію, на якой робяцца пераддаільная падрыхтоўка жывёл, выдойванне малака *даільнымі апаратамі*, яго транспартаванне, ачыстка, ахаладжэнне і забор у ёмістасць.



Схемы **дазатараў**: *а* — аб'ёмнага (1 — мерная пасудзіна, 2 — матэрыял, які дазіруецца; 3 — адсякальнік, што закрывае мерную пасудзіну і знімае лішкі матэрыялу); *б* — вагавага (1 — засаўка, якая прадухіляе паступленне матэрыялу на стужку да запаўнення мернай ёмістасці 2, 3 — транспарцёр); *в* — штучнага (1 — бункер, 2 — загатоўкі, 3 — адсякальныя штыфты, 4 — фотаэлемент, 5 — лічыльнік загатовак, 6 — крыніца святла).



Даільны апарат: *а* — схема апарата (1 — даільны стакан, 2 — калектар, 3 — пульсатар, 4 — бітон); *б* — рабочыя цыклы двухкамернага даільнага стакана (1 — ссанне, 2 — сціскванне, 3 — адпачынак).



Даільная ўстаноўка: *а* — схема ўстаноўкі (1 — электрарухавік, 2 — вакуум-помпа, 3 — вакуумны балон, 4 — вакуумметр, 5 — вакуумправод, 6 — даільны апарат); *б* — пашыраныя схемы размяшчэння даільных станкоў для даільных залаў (1 — канвеерна-кальцавая, 2 — тыпу «Елачка», 3 — тыпу «Тандэм»).

Д.ў. дояць кароў у стойлах кароўнікаў (пераноснымі і перасоўнымі даільнымі апаратамі са зборам малака ў ёмістасці ці ў малакаправоды) або ў даільных залах (абсталяваны індывідуальнымі і групавымі станкамі, размешчанымі па пэўнай схеме). Д.ў. камплектуюць абсталяваннем для аўтам. выканання некат. ручных работ (напр., пераддаільнай сан. апрацоўкі вымяў), электроннымі сістэмамі для індывід. кармлення, уліку прадукцыі, часам для перапрацоўкі малака ў малочныя прадукты (вяршкі, масла і інш.). Для даення авечак выкарыстоўваюць перасоўныя і стацыянарныя Д.ў. паралельна-прахаднога (з групавым упускам і выпускам жывёл) і карусельнага тыпаў.

Літ.: Краснокутский Ю.В., Рыжов С.В. Новые доильные аппараты и установки. М., 1984.

ДАІ́ЛЬНЫ АПАРА́Т, прызначаны для мех. *даення* кароў пад дзеяннем створанага пад саском вакууму. Складаецца з 4 даільных стаканаў (надзяюцца на соскі і высысаюць малако), калектара (размяркоўвае вакуум і збірае малако са стаканаў), пульсатара (пераўтварае пастаянны вакуум у пераменны), вядра (бітона) або малакаправода. Бываюць з 1- і 2-камернымі (найб. пашыраны) стаканамі, 2- і 3-тактавыя. Пераменнае разрэджванне перадаецца па шлангу ў даільныя стаканы, па другім малочным шлангу малако паступае ў калектар. Ёсць Д.а. з пульсатарам і калектарам, аб'яднанымі ў адзін вузел (маюць адзін сумешчаны шланг).

ДА́ЙДЖЭСТ (англ. digest літар. кароткі пераказ), 1) зборнік, асобы від часопіса, які перадрукоўвае матэрыялы з інш. выданняў у скарочаным і, як правіла, спрошчаным выглядзе. 2) Масавае выданне, якое змяшчае кароткі адаптаваны пераказ твораў маст. л-ры.

ДА́ЙЗЕНГОФЕР (Deisenhofer) Іаган (н. 30.9.1943, г. Мюнхен, Германія), нямецкі біяхімік і біяфізік. Скончыў Мюнхенскі тэхн. ун-т (1971). З 1972 у Ін-це біяхіміі імя М.Планка, з 1988 у Мед. ін-це Тэхаскага ун-та ў Даласе. Навук. працы па рэнтгеналагічным аналізе складаных біярган. злучэнняў. Расшыфраваў трохмерную структуру мембраннага інтэгральнага бялку пурпурных бактэрый, які з'яўляецца рэакцыйным цэнтрам фотасінтэзу (1982, разам з Р.*Губерам* і Г.*Міхелем*). Нобелеўская прэмія 1988.

ДА́ЙКА (англ. dike, dyke літар. перашкода), пліта або жылападобнае геал. цела ў трэшчынах зямной кары, абмежаванае паралельнымі плоскасцямі. Магутнасць Д. мяняецца ад долей да дзесяткаў метраў, працягласць ад 1 м да 500 км (напр., Вялікая Дайка ў Зімбабве). Адрозніваюць эндагенныя Д. (узніклі пры запаўненні шчылін зямной кары магмай) і экзагенныя Д. (шчыліны запоўнены асадкавым матэрыялам — т. зв. кластычныя Д.). Паводле тыпу размяшчэння бываюць Д. групавыя, радыяльныя і кальцавыя.

ДАЙЛІ́ДА Віктар Браніслававіч (н. 28.9.1930, в. Славінск Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Баранавіцкі настаўніцкі (1952) і Мінскі пед. (1957) ін-ты. Настаўнічаў, працаваў дырэктарам школ у Баранавіцкім і Слуцкім р-нах. У 1973—82 нам. дырэктара Бюро прапаганды маст. л-ры СП Беларусі. Друкуецца з 1953. Асн. тэматыка твораў — жыццё вёскі, цяжкія гады ваен. маленства (аповесць «Вясна была ранняя...», 1968; зб-кі апавяданняў і аповесцей «Вясна, хлопцы, вясна», 1966; «Была вайна...», 1969, «Буслы над вёскай», 1979).

Тв.: Сустрэча з маленствам. Мн., 1980; Пыжыкавая шапка: Гумарэскі. Мн., 1986; Гарох пры дарозе: Аповесць і апавяданні. Мн., 1991.

ДА́ЙМЛЕР (Daimler) Готліб Вільгельм (17.3.1834, г. Шорндорф, Германія — 6.3.1900), нямецкі інжынер-вынаходнік, стваральнік аўтамабіля (незалежна ад К.*Бенца*). У 1872—81 тэхн. дырэктар з-да газавых рухавікоў. У 1883 стварыў (з В.Майбахам) быстраходны (800 аб/мін) лёгкі аднацыліндравы 4-тактавы бензінавы рухавік. Устанавіў бензінавыя рухавікі на веласіпедзе (1885), лодцы (1886), 4-колавым аўтамабілі (1887). У 1890 заснаваў кампанію па выпуску рухавікоў (выпусціла першы аўтамабіль «*Мерседэс*», 1901), якая ў 1926 аб'ядналася з кампаніяй Бенца ў карпарацыю «*Даймлер-Бенц*». *Л.М.Шахлевіч.*

«ДА́ЙМЛЕР-БЕНЦ» (Daimler-Benz AG), прамысловая аўтамабільная карпарацыя ў Германіі. Засн. ў 1926. Знаходзіцца ў г. Штутгарт. У 1984 карпарацыя набыла 2-ю па велічыні ў краіне авіяракетную кампанію «Дарнье», у 1986 — буйную электратэхн. фірму «АЭГ». Выпускае аўтамабілі, у т.л. вядомую марку «Мерседэс», авіяракетную і электратэхн. прадукцыю, мед. тэхніку і інш. Па стане на 1993 на прадпрыем-



Да арт. **Дайка**. Адпрэпараваныя дэнудацыяй дайкі на схілах вулкана Этна на востраве Сіцылія.

ствах карпарацыі працавала 367 тыс. чал.

ДАЙНА́ВА, Дайнова, гістарычная вобласць на тэр. Літвы і ПнЗ Беларусі. Ахоплівала правабярэжжа Нёмана на ПнУ ад Гродна, у ніжнім цячэнні р. Мяркіс (Варэнскі р-н Літвы) і прылеглыя часткі сучасных Гродзенскага, Шчучынскага і Воранаўскага р-наў Гродзенскай вобл., адкуль дайноўцы рассяляліся на Пд і на У. Упершыню ўпамінаецца ў 1255 у грамаце (магчыма, падробленай) вял. кн. Міндоўга крыжакам. Першапачаткова займала, напэўна, тэрыторыю аднайм. зах.-балцкага (яцвяжскага) племяннога княства, якое ў 2-й пал. 13 ст. ўвайшло ў склад ВКЛ і паступова было асімілявана на Пн літоўцамі, на Пд беларусамі. Для насельніцтва Д. характэрна пахаванне нябожчыкаў у каменных курганах, пазней у каменных магілах. З 15 ст. большасць тэр. Д. займала маланаселеная Дайнаўская пушча, традыц. месца паляванняў вял. кн. літоўскіх. *В.Л.Насевіч.*

ДАЙНЕ́КА Аляксандр Аляксандравіч (20.5.1899, г. Курск, Расія — 12.6.1969), рускі жывапісец і графік. Нар. мастак СССР (1936). Правадз. чл. АМ СССР (1947, у 1962—66 віцэ-прэзідэнт АМ СССР). Герой Сац. Працы (1969). Вучыўся ў Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрнях (1920—25) у У.*Фаворскага*, І.Нівінскага. Выкладаў у Маскве ў Вышэйшым маст.-тэхн. ін-це (1928—30), паліграф. ін-це (1928—34), маст. ін-це імя Сурыкава (1934—46, 1957—63). Адзін з заснавальнікаў Т-ва станкавістаў. Яго жывапісныя творы 1920—30-х г. («У Данбасе», «Тэкстыльшчыцы», «Абарона Петраграда», «Бег», «Будучыя лётчыкі» і інш.) вылучаюцца выразнасцю формы, дынамізмам рытмічнай кампазіцыі, кантрастным спалучэннем прасторавых планаў, лаканізмам колеравых спалучэнняў. Адначасова выяўляецца і інтымная, лірычная лінія («Маці»). У гады Вял. Айч. вайны Д. стварыў гераічную карціну «Абарона Севастопаля» (1942) і шэраг суровых драм. пейзажаў. Сярод твораў манум. жывапісу пано і размалёўкі Цэнтр. т-ра Сав. Арміі (1940), мазаічныя плафоны станцый Маск. метрапалітэна «Маякоўская» (1938—39) і «Новакузнецкая» (1943), мазаікі «Добрая раніца» і «Хакеісты» (1959—60) і інш. Аўтар станковых твораў «Каля мора» (1956—57) і інш. Ленінская прэмія 1964.

Літ.: Сысоев В.П. А.Дейнека: [Альбом]. Л., 1982. *А.М.Пікулік.*

ДАЙНЕ́КА Леанід Мартынавіч (н. 28.1.1940, в. Змітраўка 2-я Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1967). Працаваў на будоўлях, на Ніжнетагільскім металургічным камбінаце, на Віцебскай студыі тэлебачання, Бел. тэлебачанні. У 1972—89 адказны сакратар час. «Маладосць». З 1989 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Друкуецца з 1961. Аўтар зб-каў вершаў, у якіх услаўленне роднай зямлі і чалавека працы, роздум над гадамі вайны, маленства, жыццём вёскі («Галасы», 1969, «Бераг чакання», 1972, «Мая вясна саракавая», 1979, «Вечнае імгненне», 1985), зб. апавяданняў «Бацькава крыніца» (1976). Раманная дылогія «Людзі і маланкі» (1977) і «Запомнім сябе маладымі» (1979) раскрывае складаныя падзеі рэвалюцыі, грамадз. вайны, барацьбы з акупантамі, станаўлення бел. дзяржаўнасці ў 1917—19. Тэму горада асэнсоўвае ў рамане «Футбол на замініраваным полі» (1987).



Г.**Даймлер**.

А.А.**Дайнека**.

Л.М.**Дайнека**.

Барацьбу народа з крыжакамі ў 12 ст. паказаў у гіст. рамане «Меч князя Вячкі» (1987, Літ. прэмія СП Беларусі імя І.Мележа 1987). Славуты полацкі князь Усяслаў Чарадзей — герой гіст. рамана «След ваўкалака» (1988, разам з папярэднім раманам Дзярж. прэмія Беларусі імя К.Каліноўскага 1990). Ранні этап станаўлення стараж. бел.-літ. дзяржавы — ВКЛ — адлюстраваў у гіст. рамане «Железныя жалуды» (1990). Аўтар фантаст. рамана «Чалавек з брыльянтавым сэрцам» (1992). Некат. вершы Д. пакладзены на музыку.

Тв.: Начныя тэлеграмы: Вершы і паэмы. Мн., 1974; Сняжынкі над агнём: Вершы і паэмы. Мн., 1989.

Літ.: Гілевіч Н. На свабодным дыханні // Гілевіч Н. У гэта веру. Мн., 1978; Бугаёў Дз. Чалавечнасць. Мн., 1985.

І.У.Саламевіч.

«ДАЙНІХО́Н СІ» («Гісторыя вялікай Японіі»), калектыўны шматтомны гіст. яп. твор. Складзены ў асноўным у 1657—1720 у княстве Міто па даручэнні кн. Міцукуні Такугава [1628—1700], завершаны ў 1906. Асвятляе паліт. гісторыю Японіі ад старажытнасці да 15 ст. (барацьбу князёў супраць *сёгунаў* з дынастыі *Такугава* за вяртанне ўлады імператару). У 1-м выданні змешчаны 243 кнігі (73 тэксты і 170 біяграфій), пазней дапоўнены табліцамі і матэрыяламі (153 кнігі). Неаднаразова перавыдаваўся.

ДАЙНЭ́КА Валерый Сяргеевіч (н. 29.11.1951, г.п. Рудзенск Мінскай вобл.), бел. эстрадны спявак. Засл. арт. Беларусі (1990). Скончыў Мінскае муз. вучылішча імя Глінкі (1971), Мінскі ін-т культуры (1988). З 1972 у Бел. філармоніі, з 1977 у ансамблі *«Песняры»*, у 1993—96 саліст Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Рэспублікі Беларусь. З 1997 выкладае ў мінскім Ін-це сучасных ведаў. У канцэртным рэпертуары творы сучасных, у т.л. бел., кампазітараў: А.Пахмутавай, І.Лучанка, Л.Захлеўнага, У.Мулявіна, В.Іванова, Дз.Даўгалёва, А.Елісеенкава на словы бел. паэтаў.

ДА́КА, горад, сталіца Бангладэш, на р. Бурыганга ў агульнай дэльце рэк Ганг і Брахмапутра. Адм. ц. вобласці Дака. 3,6 млн. ж., у гар. агламерацыі з г. Нараянгандж 6,1 млн. ж. (1991). Вузел унутр. водных шляхоў, аўтадарог. Порт даступны для марскіх суднаў. Чыг. станцыя. Міжнар. аэрапорт. Гал. эканам. і культ.

А.**Дайнека**. Будучыя лётчыкі. 1938.

цэнтр краіны. Прам-сць: баваўняная, тэкст., шкляная, гарбарна-абутковая, джутавая (гал. цэнтр апрацоўкі джуту і вырабу з яго пераважна тэхн. тканін), харч., хім., паліграф., маш.-буд., металаапр., аўтазборачная. Суднабудаванне. Цэнтр стараж. ткацкага (вытв-сць мусліну) і інш. рамёстваў, у т.л. філігранная чаканка па серабры. Гандаль рысам, джутам, цукрам, алеем. 2 ун-ты. Арх. помнікі 17—18 ст.

Стараж. горад *Бенгаліі*, у 1608—1717 яе сталіца. У 17 — пач. 18 ст. буйны цэнтр рамесніцтва і гандлю. Заваяванне Англіяй Бенгаліі ў сярэдзіне 18 ст., увоз у Індыю англ. фабр. тканін разбурылі рамесніцтва і гандаль Д. У пач. 20 ст. цэнтр нац.-вызв. руху. У 1906 у Д. створана *Мусульманская ліга*. У 1947—71 адм. цэнтр Усх. Пакістана (Усх. Бенгаліі). З 1971 сталіца Рэспублікі Бангладэш.

ДАКА́ЛЬСКАЯ Бірута Альфонсаўна (11.6.1916, Вільня — 21.4.1996), бел. актрыса. Сястра Г.А.*Дакальскай*. Вучылася ў Мінскім муз. тэхнікуме (1932—34). З 1935 у Бел. т-ры рабочай моладзі, у 1937—78 у Бел. т-ры імя Я.Купалы. Асаблівае месца ў яе творчасці займала роля Паўлінкі ў аднайм. п'есе Я.Купалы (сыграла яе больш за 450 разоў). Выконвала ролі дзяўчынак і падлеткаў, маладых дзяўчат, пазней характарныя, у якіх выявіла сапраўдны драматызм і выразную пластыку: Таццяна («Салавей» З.Бядулі), Марыля («Пінская шляхта» В.Дуніна-Марцінкевіча), Тэкля («Адкуль грэх?» А.Петрашкевіча), Сцепаніда Моўчан («Амністыя» М.Матукоўскага), Дар'я («Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага), Жонка гаспадара лазні («Характары» В.Шукшына), мадэмуазель Куку («Безыменная зорка» М.Себасцьяна) і інш.

ДАКА́ЛЬСКАЯ Галіна Альфонсаўна (н. 1910, г. Сейны, Польшча), бел. жывапісец. Сястра *Б.А.Дакальскай*. З 1928 жыла на Беларусі. Скончыла Віцебскі маст. тэхнікум (1932). Працавала ў газ. «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва». На дэкадзе бел. мастацтва ў Маскве (чэрв. 1940) экспанавалася яе карціна «Польскія акупанты ў Беларусі». З 1942 у Літве, з 1944 у эміграцыі ў Германіі, жыла ў лагеры для перамешчаных асоб у г. Кемптэн. З 1949 у ЗША, працавала ў Нью-Йорку на фабрыцы, дзе размалёўвала посуд; з 1982 жыве ў г. Санта-Моніка (штат Каліфорнія). Творчасці ўласцівы шырокі стылявы дыяпазон (ад абстракцыянізму да натуралізму), зварот да гісторыі і культуры бел. і літ. народаў. *А.С.Ляднёва.*

ДАКА́Р (Dakar), горад, сталіца Сенегала. Знаходзіцца на п-ве Зялёны Мыс — самым зах. пункце Афрыкі. 1490,4 тыс. ж. (1988). Другі па велічыні порт у Зах. Афрыцы, абслугоўвае Сенегал і Маўрытанію. Пачатковы пункт чыгункі і аўтадарог у глыб краіны. Міжнар. аэрапорт. Найважнейшы прамысл., трансп. і гандл.-фін. цэнтр Зах. Афрыкі. У Д. і яго наваколлі больш за 80% усіх прамысл. прадпрыемстваў краіны. З-ды па вытв-сці алею з арахісу, мылаварныя, мукамольныя, рыбаконсервавыя і інш. прадпрыемствы харчасмакавай прам-сці. Тэкст., фармацэўтычныя, гарбарна-абутковыя, аўтазборачныя, цэм., паліграф. прадпрыемствы. Буд-ва невял. суднаў, суднарамонт. Цэнтр турызму і зімовага адпачынку. Ун-т.

Засн. ў 1857 як франц. форт. З 1895 у складзе франц. калоніі Сенегал, у 1895—1960 яе адм. цэнтр. У 1904—59 адм. цэнтр Франц. Зах. Афрыкі. У час 2-й сусв. вайны акупіраваны англа-амер. войскамі (1942), іх стратэг. база для марскіх аперацый у Атлантычным ак., адзін з апорных пунктаў *«Змагарнай Францыі»*. З 1960 сталіца Рэспублікі Сенегал.

ДАКЕ́МБРЫЙ, найстаражытнейшыя тоўшчы зямной кары і час, аднаведны іх утварэнню. Папярэднічаў *кембрыйскай сістэме* (*перыяду*). Ахоплівае $^{6}/_{7}$ геал. гісторыі Зямлі. Працягласць фарміравання слаёў Д. — ад узнікнення найстаражытнейшых парод з радыеметрычным узростам (больш за 3,9 млрд. гадоў назад) да пачатку кембрыю (каля 540—530 млн. гадоў назад).

Падзяляецца на *архей*, які ўключае глыбокаметамарфізаваныя і гранітызаваныя пароды (гнейсы, мігматыты, крышт. сланцы, амфіболіты, кварцыты, мармуры і інш.), і *пратэразой*, што аб'ядноўвае менш зменены асадкавыя і вулканагенныя тоўшчы. Мяжа паміж імі праходзіла прыкладна 2,5 млрд. гадоў назад. З 1990 прынята больш дэталёвае стратыграфічнае расчляненне Д.: архей падзелены на ніжні і верхні (з раздзелам каля 3150 млн. гадоў); ніжні пратэразой — на ніжні і верхні (з раздзелам каля 1900 млн. гадоў); верхні пратэразой — на рыфей (ніжні, сярэдні, верхні) і венд (ніжні і верхні) з раздзелам каля 650 млн. гадоў. Адклады ранняга Д. (архей і ніжні пратэразой) складаюць фундамент стараж. платформаў. Яны выходзяць на паверхню шчытоў (Балтыйскага, Украінскага, Паўд.-Афрыканскага, Канадскага і інш.), а таксама знаходзяцца ў ядрах складкавых утварэнняў геасінклінальных абласцей. Д. — час павышанай тэктанічнай актыўнасці (гл. *Дакембрыйская складкавасць*). Мяркуюць, што з Д. звязаны пачатак працэсаў тэктонікі пліт, утварэнне асн. аб'ёму (60—80%) кантынентальнай зямной кары, узнікненне кіслароднай атмасферы, гідрасферы і зараджэнне жыцця, аб чым сведчаць шматлікія рэшткі блакітна-зялёных водарасцей, страматаліты, а таксама прыкметы існавання бесшкілетных жывёл. З Д. звязаны буйнейшыя радовішчы жалезных, уранавых, марганцавых, хромавых, сульфідных нікелевых, кобальтавых і інш. руд, радовішчы алюм. сыравіны, золата, поліметалаў. У верхніх слаях Д. трапляюцца пакладны нафты.

На тэр. Беларусі ўтварэнні Д. развіты ўсюды. Тоўшчы ранняга Д. падзяляюцца на серыі, шчучынскую і кулажынскую (архей); аколаўскую і жыткавіцкую (ранні пратэразой) і складаюць крышт. фундамент, у якім выяўлены радовішчы рэдкіх металаў, 2 радовішчы буд. каменю, 2 праяўленні жалеза (Аколаўскае і Навасёлкаўскае) і шэраг дробных — жалеза, каляровых і рэдкіх металаў, валастаніту, графіту. У верхнім Д. выяўлены вял. запасы падземных вод.

І.В.Найдзянкоў.

ДАКЕМБРЫ́ЙСКАЯ СКЛА́ДКАВАСЦЬ, працэсы ўтварэння найстаражытнейшых складкавых сістэм зямной кары на працягу *дакембрыю*. Шматразова адбывалася з рознай інтэнсіўнасцю ў выглядзе спалучэння складкавых, насоўных і разломавых дэфармацый горных парод і іх метамарфізму. Эпохі Д.с. вызначаюцца па зменах структурнага плана комплексаў парод, метамарфізаваных у рознай ступені. Пад уплывам Д.с. да канца ранняга пратэразою сфарміравалася асн. частка кантынентальнай кары сучасных мацерыкоў. Найб. познія эпохі Д.с. праяўляліся на стараж. платформах у выглядзе расколвання, частковага ператварэння кары і лакальнага магматызму. Узрост эпох Д.с. вызначаецца радыелагічнымі метадамі. Найб. значныя эпохі Д.с.: саамская (3,7—3,5 млрд. гадоў), кольская (каля 3 млрд.), беламорская (2,8—2,6 млрд.), карэльская (1,7—1,6 млрд.), грэнвільская (каля 1 млрд.) і байкальская (680—480 млн. гадоў).

І.В.Найдзянкоў.

ДА́КІ (лац. Daci), група паўн.-фракійскіх плямён, якія засялялі тэр. на Пн ад Дуная да Карпацкіх гор (сучасная Трансільванія). У 7—4 ст. да н.э. былі пад уплывам качэўнікаў-скіфаў, у 3—2 ст. да н.э. — кельтаў. Д. гандлявалі з Грэцыяй, Італіяй, чаканілі манету, апрацоўвалі металы. У 1 ст. да н.э. аб'ядналіся з *гетамі*, але саюз хутка распаўся. Найвыш. росквіту дасягнулі ў часы *Дэцэбала* (87—106 н.э.), які стварыў магутную дзяржаву. Страцілі незалежнасць у выніку войнаў (101—102 і 105—106) з рым. імператарам *Траянам*, краіна стала рым. правінцыяй *Дакія*.

ДА́КІЯ (Dacia), у старажытнасці вобласць, населеная *дакамі*. Займала тэр. паміж Дунаем, Цісай, Карпатамі і Днястром — тэр. сучаснай Румыніі. Пасля заваявання *Траянам* (106 н.э.) — рым. правінцыя. У 118—119 падзелена на Верхнюю і Ніжнюю Д., у 158—159 — на 3 правінцыі, якія да пач. войны з маркаманамі (166) аб'ядналіся пад назвай «правінцыі 3 Д.». *Аўрэліян* пад націскам гатаў (з 236) і карпаў (з 248) пакінуў Д. У 270—275 ч. карэннага насельніцтва перасялілася на правы бераг Дуная, дзе былі створаны 2 правінцыі — Д.Прыбярэжная і Д.Унутраная; левабярэжную Д. занялі готы, вандалы і інш.

ДАКЛА́ДНАСЦІ КЛА́СЫ, гл. *Класы дакладнасці*.

ДАКЛА́ДНАСЦЬ, ступень прыбліжэння сапраўднага значэння параметраў працэсу, прадмета, рэчыва да іх тэарэт. намінальнага значэння.

Д. а п р а ц о ў к і — ступень прыбліжэння формы, памераў і становішча апрацаванай паверхні дэталі да патрабаванняў чарцяжа і тэхн. умоў. Вызначаецца *квалітэтам*. Д. в ы м я р э н н я ў — характарыстыка *вымярэнняў*, якая паказвае ступень блізкасці да нуля *хібнасці вымярэнняў*. Лікава выражаецца значэннем, адваротным модулю аднаснай хібнасці (АХ) вымярэння. Напр., пры АХ, роўнай 2% (або 0,02), Д. вымярэнняў роўная 1/0,02 = 50. Д. м е р ы і в ы м я р а л ь н а й п р ы л а д ы — ступень блізкасці значэнняў *меры* або паказання прылады да сапраўднага значэння велічыні, якая ўзнаўля-

ецца мерай або вымяраецца прыладай (гл. *Класы дакладнасці*). Д. лічбавай вымяральнай машыны характарызуецца значэннем макс. хібнасці выніку вылічэнняў. Павышаецца зменай метаду вылічэнняў (павелічэннем ліку аперацый, зменай іх парадку і г.д.) або ўвядзеннем аперацый з лікамі павялічанай разраднасці.

ДАКЛЯРО́ВІЧ (таксама Дыклер, імя невяд.; 1746?, г. Слуцк Мінскай вобл. — ?), танцоўшчык. З мяшчан. З 1756 вучыўся ў мясц. балетнай школе кн. Г.Ф.Радзівіла (педагогі А.*Пуціні* і Л.М.*Дзюпрэ*) і танцаваў у яго прыдворным т-ры ў Слуцку (дэбютаваў у 1758 у «Балеце на тры пары», лібрэта і паст. Пуціні), а таксама ў Белым (Бяла-Падляска, Польшча), гастраліраваў у Нясвіжы. З 1760 вядучы танцоўшчык балетнай трупы Нясвіжскага т-ра М.К.Радзівіла Рыбанькі. *Г.І.Барышаў.*

ДАКО́ЛЬКА, Даколь, рака ў Старадарожскім р-не Мінскай вобл. і Глускім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. Пціч (бас. р. Прыпяць). Даўж. 43 км. Пл. вадазбору 462 км^2. Пачынаецца за 2 км на ПнУ ад в. Кармазы Старадарожскага р-на, цячэ па паўн. ч. Прыпяцкага Палесся. Асн. прытокі — р. Сноўка (справа) і р. Ольніца (злева). Даліна невыразная. Шыр. рэчышча 5—20 м, у вусці — 12 м. Каналізаваная на ўсім працягу.

ДАКО́ЎСКІ Дака (7.8.1919, с. Тырнак Врачанскай акругі, Балгарыя — 28.1.1962), балгарскі кінарэжысёр. Засл. арт. Балгарыі (1963, пасмяротна). У 1938—41 акцёр у т-рах Сафіі і Скопле. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1952). Дэбютаваў фільмам «Пад прыгнётам» (паводле І.Вазава, 1952; Дзімітроўская прэмія 1953). Яго творчасці характэрна распрацоўка гераічных характараў і значных тэм: «Беспакойны шлях» (1955, Дзімітроўская прэмія 1959), «Тайная вячэра седмакоў» (1957; у сав. пракаце «Закон дазваляе»), «Стубленскія ліпы» (1960) і інш.

ДАКРЫЯАДЭНІ́Т (ад грэч. dakryon сляза + *адэн...* + *...іт*), запаленне слёзнай залозы вока. Бывае востры і хранічны. Востры Д. найчасцей інфекц. паходжання. Прыкметы: ацёк, боль, пачырваненне кан'юнктывы вонкавай часткі верхняга павека, можа павышацца тэмпература цела. Лячэнне тэрапеўтычнае. Хранічны Д. узнікае на фоне некат. хвароб (туберкулёз, сіфіліс, хвароба Мікуліча і інш.).

ДАКРЫЯЦЫСТЫ́Т (ад грэч. dakryon сляза + *цыстыт*), запаленне слёзнага мяшка вока. Бывае хранічны і востры. Прычына Д.: звужэнне ці поўнае закрыццё слёзна-насавога канала, затрымка адтоку слёзнай вадкасці з поласці слёзнага мяшка і развіццё ў ім патагенных мікробаў. Д. у нованароджаных бывае пры закрытым прасвеце слёзна-насавога канала зародкавай перапонкай. Прыкметы: слёзацячэнне і гнойныя выдзяленні ў кан'юнктывальнай поласці; пры націсканні на вобласць слёзнага мяшка са слёзных кропак выдзяляецца слізістая ці гнойная вадкасць. Лячэнне хірургічнае, у нованароджаных — масаж, прамыванне антысептычнымі растворамі пад ціскам ці зандзіраванне металічным зондам слёзна-насавога канала. *Л.М.Марчанка.*

ДАКС (Dax), прыморскі бальнеагразевы і кліматычны курорт у Францыі. На ПнУ ад г. Баёна, на беразе р. Адур. Вядомы з часоў Стараж. Рыма; развіваецца з 19 ст. Мяккі марскі клімат, мулавыя гразі і мінер. воды выкарыстоўваюцца для лячэння хвароб органаў дыхання, перыферычнай нерв. сістэмы, суставаў. Цэнтр турызму. Арх. помнікі 13 ст., музей фізіка і геадэзіста Ж.Бардо.

ДАКТРЫ́НА (лац. doctrina), сістэматызаванае вучэнне (звычайна філас., паліт., ідэалаг.), звязная канцэпцыя, сукупнасць тэарэт. ці паліт. прынцыпаў, напр., *ваенная дактрына*. Тэрмінам Д. звычайна карыстаюцца пры абазначэнні поглядаў з адценнем схаластычнасці і дагматызму. Фармальнае, некрытычные прытрымліванне пэўнай Д. наз. дактрынёрствам.

ДАКТУРО́ЎСКІ Уладзімір Сямёнавіч (18.11.1884, г. Мікалаеў, Украіна — 20.3.1935), савецкі балотазнавец і палеабатанік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1907). З 1908 працаваў у Пецярбургскім бат. садзе, з 1918 на навук. і пед. рабоце ў Маскве, з 1934 у БДУ. Распрацаваў метад вывучэння сувязі паміж раслінным покрывам, водным рэжымам, геал. будовай балот і хім. саставам торфу. Увёў у практыку метад пылковага аналізу торфу. Склаў падрабязную характарыстыку балотных масіваў Беларусі, еўрап. ч. Расіі, Закаўказзя, Зах. Сібіры, Д. Усходу.

Тв.: Тарфяныя балоты, іх утварэнне і развіццё. Мн., 1930.

ДАКТЫЛА... (ад грэч. daktylos палец), першая састаўная частка складаных слоў, што абазначае: які звязаны з пальцамі, які адносіцца да пальцаў, напр., *дактылалогія*, *дактыласкапія*.

ДАКТЫЛАЛО́ГІЯ (ад *дактыла*... + *...логія*), спосаб зносін глухіх людзей з дапамогай ручной азбукі. Шырока выкарыстоўваецца ў першапачатковы перыяд абучэння глухіх дзяцей (у дзіцячым садку і школе) як вядучы сродак фарміравання мовы і зносін, таксама адзіны сродак зносін сярод слепаглуханямых. У ручной азбуцы столькі ж знакаў, колькі літар у алфавіце. Паводле абрысу многія дактыльныя знакі нагадваюць літары і звычайна паказваюцца пальцамі адной рукі. Той, хто гаворыць, мяняе фігуры з пальцаў, а той, хто ўспрымае, складае з іх словы. Мовы з рознымі алфавітамі маюць кожная сваю дактылалагічную сістэму. На Беларусі пашырана рус. Д. Законам Рэспублікі Беларусь аб сац. ахове інвалідаў (1991) мова жэстаў прызнаецца ў якасці сродку міжасобасных зносін, навучання і прадастаўлення паслуг перакладу.

ДАКТЫЛАСКАПІ́Я (ад *дактыла*... + *...скапія*), галіна ведаў, якая вывучае будову ўзораў скуры рук з мэтай *ідэнтыфікацыі* асобы. На далоневай паверхні канцавых (ногцевых) фалангаў пальцаў рук ёсць рэльефныя лініі (т. зв. папілярныя), якія строга індывідуальныя, адносна ўстойлівыя і здольныя аднаўляцца ў былым выглядзе пры паверхневым парушэнні скурнага покрыва. З улікам відаў і тыпаў скурнага ўзору, іх дадатковых асаблівасцей выводзіцца т. зв. дактыласкапічная формула, якая служыць асновай сістэматызацыі дактыласкапічных картаў у картатэках. Найб. шырока выкарыстоўваюцца ў *крыміналістыцы*: па адбітках пальцаў рук ажыццяўляюцца: крыміналістычная ідэнтыфікацыя асобы злачынца; устанаўленне злачынца, які быў раней зарэгістраваны як судзімы; ідэнтыфікацыя неапазнаных трупаў; пошук асоб, што прапалі без вестак, і інш. Метады Д. выкарыстоўваюць таксама ў *антрапалогіі*, медыцыне, банкаўскай справе і інш. галінах навукі, практычнай дзейнасці.

С.У.Скаруліс.

ДА́КТЫЛІ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі дэманічныя істоты, спадарожніцы Рэі-Кібелы. Лічылася, што жылі яны на гары Іда ў Фрыгіі. Ім прыпісвалі адкрыццё апрацоўкі жалеза, а таксама заснаванне Алімпійскіх гульняў.

ДА́КТЫЛЬ (грэч. daktylos літар. палец), 1) у *антычным вершаскладанні* 4-дольная стапа з 3 складоў — першага доўтага і двух наступных кароткіх (-⏑⏑). Выкарыстоўвалася ў пентаметры і гекзаметры. 2) У *сілаба-танічным вершаскладанні* 3-складовая стапа з рытмічным націскам на 1-м складзе (́--). У бел. паэзіі Д. паявіўся ў канцы 19 ст. з развіццём сілаба-танічных вершаваных формаў (верш Я.Лучыны «Роднай староніцы»). 3-стопным Д. напісаны вершы М.Танка «Шчасце», 4-стопным — М.Багдановіча «Вечар на захадзе ў попеле тушыць...», 5-стопным — Танка «Надпіс на кнізе». *А.А.Майсейчык.*

ДАКУ́ДАВА, вёска ў Крупскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 18 км на З ад Крупак, 98 км ад Мінска, 9 км ад чыг. ст. Прыяміна. 442 ж., 153 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДАКУ́ДАВА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Нёман. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Ліда, 135 км ад Гродна. 723 ж., 318 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Царква. Каля вёскі стаянка эпохі мезаліту і неаліту нёманскай культуры.

ДАКУ́ДАЎСКАЕ БАЛО́ТА, у Лідскім р-не Гродзенскай вобл., у вадазборы р. Лідзея (прыток Дзітвы) і р. Нарва (прыток Нёмана). Нізіннага, вярховага і мя-

шанага тыпаў. Пл. 7,8 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 6,3 тыс. га. Глыб. торфу 6,7 м, сярэдняя 3 м. Ёсць сапрапель. Асушаная ч. балота выкарыстоўваецца для торфаздабычы і для вырошчвання пераважна сеяных траў. На неасушанай ч. растуць карлікавая бяроза, хвоя, вярба, асокі, журавіны.

ДАКУМЕ́НТ (ад лац. documentum сведчанне, доказ), 1) дзелавая папера, што юрыдычна пацвярджае які-н. факт (напр., нараджэнне, узяцце шлюбу) ці права на што-н. (напр., дыплом, завяшчанне). 2) Афіц. пасведчанне асобы (напр., пашпарт). 3) Пісьмовыя помнікі пра гіст. падзеі. 4) Матэрыяльны носьбіт (папера, кіна- і фотаплёнка, магн. стужка і інш.) з запісанай на ім інфармацыяй, прызначанай для захоўвання і перадачы ў часе і прасторы.

ДАКУМЕНТАЗНА́ЎСТВА, навуковая дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці складання дакументаў, распрацоўвае спосабы іх стварэння, прынцыпы арганізацыі дакументаабарачэння і пабудовы сістэм дакументацыі. Вылучылася з *архівазнаўства* і архіўнай службы. Звязана з *крыніцазнаўствам*, якое таксама мае аб'ектам даследавання дакумент. Задачы Д.: павышэнне эфектыўнасці дакументацыйнага забеспячэння аператыўнага кіравання, барацьба з ростам выдаткавання паперы і павелічэння плошчаў, занятых пад сховішчы інфармацыі. Д. выконвае канкрэтныя патрэбы грамадства ў дакументальнай сферы: паляпшэнне якасці дакумента і прыстасаванне яго да ўмоў машыннай апрацоўкі інфармацыі; стварэнне машыначытальных дакументаў, мініяцюрызацыя носьбітаў і пераход да бездакументных камунікацый; забеспячэнне выкарыстання дакументаў у аўтаматызаваных банках даных; стварэнне інфармацыйна-пошукавай сістэмы (ІПС) па дакументах, што функцыяніруюць у апараце, і яе сумяшчальнасць з ІПС дзярж. архіваў; распрацоўка рацыянальнай сістэмы ўліку і захоўвання дакументаў; наданне юрыд. сілы інфармацыі, запісанай на машынных носьбітах. З 1966 даследаваннямі ў галіне Д. займаўся Усесаюзны НДІ Д. і архіўнай справы; у якасці сураспрацоўшчыкаў тэм выступалі цэнтр. дзярж. архівы Беларусі. Пытаннямі Д. займаюцца аддзел справаводства і фарміравання Нац. архіўнага фонду Дзярж. к-та па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь і Бел. НДІ Д. і архіўнай справы (у 1992—95 Бел. н.-д. цэнтр Д., археаграфіі і архіўнай справы).

ДАКУМЕНТА́ЛЬНАЕ КІНО́, від кінамастацтва, заснаванага на здымках сапраўдных жыццёвых падзей, з'яў, фактаў. Складаецца з кінахронікі, якая ў рэпартажных і хранікальных паведамленнях аператыўна інфармуе гледачоў пра найважнейшыя падзеі, і вобразнай кінапубліцыстыкі (дакумент. фільм). З паяўленнем тэлебачання ўзнікла тэлевізійнае Д.к., якое, выкарыстоўваючы прыёмы, формы, прынцыпы кінамастацтва, зрабіла разнастайныя з'явы і падзеі рэальнага жыцця масавым відовішчам.

Узнікненне Д.к. звязана з зараджэннем кінематографа. Першыя здымкі (1895) вынаходнікаў кіно братоў Люм'ер былі зроблены з натуры. Развіццё сав. Д.к. звязана з пошукамі рэжысёраў Дз.Вертава, У.*Гардзіна*, У.Ерафеева, У.Шнейдэрава, Р.*Кармэна*, аператараў Р.Гібера, Э.*Ціса*, А.Лявіцкага і інш. У гады 2-й сусв. вайны вял. значэнне набыў рэпартаж. Дасягненні Д.к. ў пасляваен. час знайшлі канцэнтраванае выражэнне ў фільме «Звычайны фашызм» рэжысёра М.*Рома*.

На Беларусі развіццё кінематографа пачалося з хронікі. У 1925 выйшлі першыя кінавыпускі і дакумент. фільм «У здаровым целе — здаровы дух» (рэж. і аператар М.Лявоніцьеў). У 1925—27 аператары Лявоніцьеў і М.Люлякоў рэгулярна здымалі хранік. сюжэты пра важныя падзеі ў грамадска-паліт. жыцці рэспублікі. У 1931 створаны сектар кінахронікі ў *Белдзяржкіно*, пачаўся выпуск кіначасопісаў. У 1935 арганізавана *Мінская студыя кінахронікі*. У Вял. Айч. вайну бел. кінадакументалісты стварылі летапіс партыз. барацьбы ў рэспубліцы, рабілі франтавыя кінавыпускі; яны ўдзельнічалі ў здымках фільмаў «Дзень вайны» і «У тыле ворага» (абодва 1942), «Бой за Віцебск», «Мінск наш», «Бабруйскі кацёл» (усе 1944), поўнаметражнага «Вызваленне Савецкай Беларусі» (1944, рэж. У.Корш-Саблін і М.Садковіч); асобныя кінакадры бел. аператараў выкарыстаны ў кінаэпапеі «Вялікая Айчынная» (1979). З 1944 дакумент. фільмы здымалі на адноўленай кінастудыі «Беларусьфільм». У пасляваен. час у галіне Д.к. працавалі рэжысёры Л.Голуб, Корш-Саблін, С.Сплашноў, І.Вейняровіч. У 1961 арганізавана *Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў*, з 1968 існуе як аб'яднанне дакумент. фільмаў «*Летапіс*» на кінастудыі «Беларусьфільм». Сярод вядомых дзеячаў Д.к. Беларусі П.Аліфярэнка, В.Дашук, Ю.Лысятаў, І.Пікман, Б.Сарахатунаў, У.Стральцоў, У.Сукманаў, С.Фрыд, Ю.Цвяткоў, Р.Ясінскі.

І.В.Ратнікаў.

«ДАКУМЕ́НТЫ ПА́ПСКІХ НУ́НЦЫЯЎ ПА ГІСТО́РЫІ УКРАІ́НЫ І БЕЛАРУ́СІ» [«Litterae nuntiorum Apostolicorum (in Polonia, Austria, Venetiis etc.) historiam Ucrainae et Bielarussjae illustrantes», vol 1—13 (1550—1683)], серыйнае рымскае выданне дакумент. матэрыялаў, складзеных папскімі нунцыямі (пасламі) у Польшчы (з 1569 — Рэчы Паспалітай). Распачаў яго ў 1959 (1-ы том ахоплівае матэрыялы 1550—93) укр. археограф, протаархімандрыт ордэна *базыльян* Анастасій (Грыгорый) Вялікі, працягваюць інш. ватыканскія гісторыкі; выйшла 14 тамоў. Большая частка дакументаў на лац. і італьянскай мовах. Змяшчае спаваздачы і пасланні нунцыяў у Рым, іх перапіску з царк. дзеячамі і інш. дакументы з Ватыканскага архіва. З'яўляецца важнай крыніцай для вывучэння гісторыі каталіцкай царквы на землях Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны, *Брэсцкай уніі 1596*. *Г.Я.Галенчанка.*

«ДАКУМЕ́НТЫ, ШТО ТЛУМА́ЧАЦЬ ГІСТО́РЫЮ ЗАХОДНЯРУ́СКАГА КРА́Ю», «Документы, объясняющие историю Западно-Русского края и его отношения к России и к Польше», зборнік дакументаў, выдадзены ў 1865 Археаграфічнай камісіяй у С.-Пецярбургу. Падрыхтаваны ў сувязі з паўстаннем 1863—64, разлічаны на замежнага чытача і мае выключна паліт. характар. Дакументы надрукаваны на мове арыгінала і ў перакладзе на франц. мову. Паводле слоў рэдактара і аўтара прадмовы М.В.Каяловіча, мэта зборніка — даказаць, што «заходнярускі край» быў рускім, а не польскім. Публікацыя дакументаў пачынаецца з прывілея караля Ягайлы, дадзенага ў 1387 віленскаму біскупу. Большасць змешчаных дакументаў была апублікавана раней. Сярод надрукаваных упершыню ўрыўкі з дзённіка Люблінскага сейма 1569, крыніцы з архіва уніяцкіх мітрапалітаў.

Літ.: Улащик Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973.

М.Ф.Шумейка.

ДАКУТО́ВІЧ Барыс Нічыпаравіч (н. 1.8.1921, Масква), рускі рэжысёр. Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1951), дзе і выкладаў да 1958. Працаваў у т-рах Расіі. У 1958—63 на Беларусі: гал. рэжысёр Дзярж. рус. т-ра БССР (1958—60) і Бел. рэсп. т-ра юнага гледача (1962—63). Пастаноўкам Д. ўласціва яркая тэатр. форма, вобразна-асацыятыўная сцэн. мова, інтэлектуальнасць: «Іркуцкая гісторыя» А.Арбузава (1960), «Чырвоныя чарцяняты» П.Бляхіна, А.Палявога і А.Талбузіна (1961), «Клоп» У.Маякоўскага (1962), «Бітва ў космасе» М.Гамолкі (1963). Аўтар кніг «Акцёр і роля: Некаторыя рэжысёрскія ўрокі Ю.А.Завадскага» (1983), «Загадкі малой драматургіі» (1989).

ДАКУЧА́ЕЎ Васіль Васілевіч (1.3.1846, с. Мілюкова Смаленскай вобл., Расія — 8.11.1903), рускі вучоны-прыродазнавец, заснавальнік навук. генет. глебазнаўства і занальнай аграхіміі. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1871). З 1880 выкладаў у ім, з 1883 праф., у 1892—97 дырэктар Новаалександрыйскага ін-та сельскай гаспадаркі і лесаводства (заснаваў у ім першую ў Расіі кафедру глебазнаўства, 1895). Стварыў вучэнне пра геагр. зоны. Абгрунтаваў навук. класіфікацыю глеб (1886), распрацаваў комплекс мер па барацьбе з засухай, метады картаграфавання і склаў першую глебавую карту паўн. паўшар'я. Імя Д. прысвоена Глебаваму ін-ту і Цэнтр. музею глебазнаўства УАСГНІЛ. З 1946 прысуджаецца залаты медаль і прэмія імя Д. АН СССР.

Тв.: Соч. Т. 1—9. М.; Л., 1949—61.

Літ.: Рагавой П.П. В.В.Дакучаеў. Мн., 1951.

ДАКЭ́Н-ДАБА́Н, Рытэра хрыбет, горны хрыбет у зах. ч. Наньшаня, у Кітаі. Даўж. каля 200 км. Выш. да 5926 м. Складзены з крышт. сланцаў, пясчанікаў, філітаў. Слаба расчлянёны. Стромкія кароткія схілы пераходзяць каля падножжа ў галечна-друзаватыя нахільныя раўніны. У цэнтр. частцы — ледавікі. Горныя пустыні, стэп. Даследаваны і названы М.М.*Пржавальскім* у гонар ням. географа К.Рытэра.

ДАЛАДЗЬЕ́ (Daladier) Эдуар (18.6.1884, г. Карпантра, Францыя — 10.10.1970), французскі паліт. і дзярж. дзеяч, дыпламат. Чл. *Рэспубліканскай партыі радыкалаў* і *радыкал-сацыялістаў*, у 1927—31, 1935—38, 1957—58 яе старшыня. Дэп. парламента (1919—40, 1946—58). Ваен. міністр (1932—34), міністр абароны (1936—40). Прэм'ер-міністр Францыі ў 1933, 1934, 1938—40. Адзін з заснавальнікаў Нар. фронту (1936). У знешняй палітыцы прыхільнік кампрамісу з фаш. Германіяй (гл. *Мюнхенскае пагадненне 1938*). Удзельнік *Маскоўскіх перагавораў 1939*. 3.9.1939 урад Д. абвясціў Германіі вайну. Пасля капітуляцыі Францыі арыштаваны (1940) і асуджаны (1942) урадам «Вішы». У 1943—45 інтэрніраваны ў Германіі. У 1947—54 кіраваў дзейнасцю «Аб'яднання левых рэспубліканцаў». Выступаў супраць калан. вайны Францыі ў Індакітаі (1946—54), стварэння «Еўрапейскага абарончага супольніцтва». Пасля ўстанаўлення ў Францыі Пятай рэспублікі (1958) адышоў ад палітыкі.

ДАЛА́Й-ЛА́МА [ад манг. далай — мора (мудрасці) + *лама*], тытул паліт. (да 1951) і духоўнага ўладыкі тыбецкага народа; першасвяшчэннік ламаісцкай царквы (гл. *Ламаізм*). З'яўляецца таксама духоўным аўтарытэтам будыстаў тых тэрыторый, што апынуліся пад уплывам тыбецкай цывілізацыі (Манголія, Бурацыя, Тува, Калмыкія і інш.). Тытул Д.-л. ўстаноўлены ў 1391. Д.-л. — абаронца веруючых, зямное ўвасабленне Авалакітэшвары, будысцкай персаніфікацыі міласэрнасці. Вядома 14 носьбітаў тытула Д.-л., якіх веруючыя прымаюць за аднаго. Лічыцца, што Д.-л. не памірае, а пераўвасабляецца ў дзіця, якое нараджаецца ў час смерці Д.-л.

Першым Д.-л. быў Гедундуб (1391—1474). 5-ы — Агван Лабзан Джамцо падпарадкаваў сваёй уладзе амаль увесь Тыбет, ператварыў яго ў тэакратычную дзяржаву; вядомы як гісторык і літаратар, стваральнік новай драматургіі містэрый цам (свята ў масках). 14-ы Тэндзін Г'ятсо (Д.-л. з 1940).

ДАЛАЙНО́Р, Хулуньчы, возера на ПнУ Кітая, на выш. 539 м. Пл. (пры высокім узроўні вады) каля 1100 км^2. Глыб. 6—9 м. Жывіцца водамі рэк Керулен і Арчун-Гол; у час высокіх узроўняў — сцёк у р. Аргунь. Берагі нізкія, месцамі забалочаныя, занятыя трысняком.

Д'АЛАМБЕ́Р (D'Alembert) Жан Лерон (16.11.1717, Парыж — 20.10.1783), французскі механік, матэматык і філосаф-асветнік; адзін з заснавальнікаў матэм. фізікі. Чл. Парыжскай (1754) і Пецярбургскай АН (1764) і інш. акадэмій. Скончыў Калеж Мазарыні (1735). Навук. працы па механіцы, гідрадынаміцы, матэматыцы і філасофіі. У «Трактаце аб дынаміцы» (1743) сфармуляваў агульныя правілы складання дыферэнц. ураўненняў руху мех. сістэм. Устанавіў

В.В.**Дакучаеў**.

Э.**Даладзье**.

Ж.Л.**Д'аламбер**.

3 асн. прынцыпы механікі: інерцыі, паралелаграма сіл і раўнавагі (*Д'аламбера прынцып*). Аўтар «Трактата аб раўнавазе і руху вадкасцей» (1744). Распрацаваў метад рашэння дыферэнц. ураўненняў 2-га парадку з частковымі вытворнымі. У астраноміі абгрунтаваў тэорыю ўзбурэнняў планет. Як філосаф стаяў на пазіцыях *дуалізму*. Разам з Д.*Дзідро* працаваў над стварэннем «Энцыклапедыі навук, мастацтваў і рамёстваў».

Тв.: Рус. пер. — Динамика. М.; Л., 1950.
Літ.: Добровольский В.А. Даламбер. М., 1968.

Д'АЛАМБЕ́РА ПРЫ́НЦЫП, адзін з асноўных прынцыпаў дынамікі, паводле якога пры далучэнні сіл інерцыі да зададзеных (актыўных) сіл і рэакцый накладзеных сувязей атрымліваецца ўраўнаважаная сістэма сіл. Устаноўлены Ж.*Д'аламберам*. З Д.п. вынікае, што для кожнага пункта сістэмы $\vec{F}_i + \vec{N}_i + \vec{J}_i = 0$, дзе $\vec{F}_i$ — актыўная сіла, што ўздзейнічае на дадзены пункт, $\vec{N}_i$ — рэакцыя накладзенай сувязі (гл. *Сувязі механічныя*), $\vec{J}_i$ — сіла інерцыі. Д.п. дазваляе выкарыстаць метады статыкі для рашэння задач дынамікі, напр., для вызначэння рэакцыі сувязей, калі вядомы закон руху.

Д'АЛАМБЕ́РА—ЛАГРА́НЖА ПРЫ́НЦЫП, адзін з асноўных прынцыпаў дынамікі, паводле якога пры далучэнні сіл інерцыі да зададзеных (актыўных) сіл, што дзейнічаюць на пункты сістэмы з ідэальнымі *сувязямі механічнымі*, сума работ актыўных сіл і сіл інерцыі на любым магчымым перамяшчэнні сістэмы роўная нулю. Дае агульны метад рашэння задач дынамікі і статыкі, дазваляе вывучаць рух мех. сістэмы без увядзення ва ўраўненні невядомых рэакцый сувязей. Названы па імёнах Ж.*Д'аламбера* і Ж.*Лагранжа*. Гл. таксама *Варыяцыйныя прынцыпы механікі*.

ДАЛАМІ́Т (ад прозвішча франц. мінералога Д.Далам'ё), 1) мінерал класа карбанатаў, карбанат кальцыю і магнію, $CaMg(CO_3)_2$. Крышталізуецца ў трыганальнай сінганіі. Крышталі ромбаэдрычныя, прызматычныя, таблітчастыя. Агрэгаты грубазярністыя да шчыльных мас. Колер шаравата-белы, часам з жаўтаватым, бураватым, зеленаватым адценнем. Бляск шкляны. Паўпразрысты да празрыстага. Цв. 3,5—4. Шчыльн. 2,9—3,2 г/см^3. Пашыраны пародаўтваральны мінерал пераважна асадкавага, радзей гідратэрмальнага паходжання, трапляецца і як жыльны. 2) Асадкавая карбанатная горная парода, якая складаецца на 95% і больш з Д. Асн. прымесі кальцыт, ангідрыт. Нярэдка складае глыбока расчлянёныя горныя хрыбты і масівы (напр., Даламітавыя Альпы ў Італіі). Здольная да карставання. Радовішчы вельмі шматлікія. На Беларусі выяўлена 10 радовішчаў Д. з агульнымі запасамі каля 1 млрд. т. Выкарыстоўваецца як вогнетрывалы матэрыял і флюс у металургіі, як сыравіна ў хім. і шкляной прам-сці, сельскай гаспадарцы (для вапнавання глеб) і інш.

У.Я.Бардон.

ДАЛАМІ́ТАВЫЯ А́ЛЬПЫ (Alpi Dolomiti), горны масіў ва Усх. Альпах, на ПнУ Італіі. Даўж. 120 км. Выш. да 3342 м (г. Мармалада). Характэрны зубчас-

Даламіт.

тыя грабяні і стромкія схілы. Складзены з даламітаў і вапнякоў. Ліставыя і хваёвыя лясы. Снежнікі і ледавікі. Некалькі рэзерватаў. Курорты (Корціна-д'Ампеца і інш.). Турызм, зімовыя віды спорту.

ДАЛАПІ́КАЛА (Dallapiccola) Луіджы (3.2.1904, г. Пазін, Славенія — 17.2.1975), італьян. кампазітар, піяніст, педагог. Чл. *Міжнароднага музычнага савета.* Скончыў кансерваторыю ў Фларэнцыі (клас фп., 1924; кампазіцыі, 1931), у 1934—67 выкладаў у ёй (прафесар), а таксама ў ЗША (1951—57), на летніх курсах *Моцартэума* ў Зальцбургу (1963—64). З 1930 канцэртаваў. У пач. творчасці схіляўся да італьян. неакласіцызму, потым выкарыстоўваў *дадэкафонію, серыйную тэхніку,* не адмаўляючыся ад *дыятонікі* і напеўнай мелодыкі. У многіх творах выяўляў свабадалюбныя памкненні асобы, пратэст супраць насілля (оперы «Начны палёт», 1940, «Вязень», 1948, «Уліс», 1968; кантата «Песні вязняў», 1941). З інш. твораў: балет «Марсій» (паст. 1948), містэрыя «Іоў» (1950), кантаты, хары, інстр. канцэрты.

ДА́ЛАС (Dallas), горад на Пд ЗША, на р. Трыніты ў штаце Тэхас. 1022 тыс. ж., з г. Форт-Уэрт і прыгарадамі 3,9 млн. ж. (1993). Важны трансп. вузел, гандл.-фін. цэнтр Поўдня ЗША, арганізац. цэнтр нафтагазавай прам-сці раёна. Міжнар. аэрапорт. Цэнтр машынабудавання (вытв-сць нафтавага, халадзільнага, агульнапрамысл. абсталявання). Прам-сць: радыёэлектронная (вытв-сць паўправаднікоў і сродкаў сувязі), авіяракетная, харч., швейная, паліграф., папяровая, хім. (вытв-сць мыла і сінт. мыйных сродкаў), нафтаперапр., вытв-сць адзення і скургалантарэі. 2 ун-ты. Музеі. Тэатры. Турызм.

Засн. ў 1841 як гандл. факторыя, з 1856 горад. У час грамадз. вайны 1861—65 адзін з цэнтраў канфедэратаў. У 2-й пал. 19 ст. цэнтр гандлю бавоўнай. З 1930-х г. эканоміка горада звязана з эксплуатацыяй выяўленых там радовішчаў нафты. У час 2-й сусв. вайны стаў цэнтрам прам-сці, у т.л. авіябудаўнічай. У 1963 у Д. забіты прэзідэнт ЗША Дж. Ф.*Кенэдзі.*

ДАЛГАЛЁЎ Васіль Барысавіч (н. 25.5.1951, г. Рагачоў Гомельскай вобл.), дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1974), Бел. дзярж. эканам. ун-т (1994). З 1974 ст. інжынер магілёўскіх аб'яднанняў «Сельгастэхніка», «Хімвалакно», нам. нач. аддзела з-да «Электрарухавік», нам. дырэктара Рагачоўскага з-да «Дыяпрактар». У 1992—95 нам. старшыні Кантрольнай палаты, нач. Службы кантролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 1995—97 нам. Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. З ліп. 1997 паўнамоцны прадстаўнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у органах Саюза Беларусі і Расіі, упраўлення інтэграцыяй Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі і Рас. Федэрацыі, СНД і ўрадзе Рас. Федэрацыі — нам. Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. З'яўляецца нам. Старшыні Выканкома Саюза Беларусі і Расіі, старшынёй Савета Белбізнесбанка. Дэп. Вярх. Савета БССР (з 1991 Рэспублікі Беларусь) у 1990—95, Вярх. Савета СССР у 1991. Чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР у 1991.

ДАЛГАПЛО́СК Барыс Аляксандравіч (12.11.1905, в. Лукомль Чашніцкага р-на Віцебскай вобл. — 18.7.1994), са-

Б.А.**Далгаплоск**.

Н.Г.**Дален**.

вецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1964; чл.-кар. 1958). Герой Сац. Працы 1963. Скончыў Маскоўскі ун-т (1931). У 1946—63 у НДІ АН СССР, з 1963 у Ін-це нафтахім. сінтэзу Рас. АН. Навук. працы па тэорыі полімерызацыі і сінтэзу каўчукоў. Адкрыў і даследаваў з'яву аксідарэдукцыйнага ініцыравання радыкальных працэсаў (1939), новы тып ланцуговых рэакцый пад уплывам карбенавых комплексаў пераходных металаў (1980). Распрацаваў асновы сінтэзу каўчукоў метадам эмульсійнай полімерызацыі. Ленінская прэмія 1984, Дзярж. прэмія СССР 1941, 1949.

Тв.: Генерирование свободных радикалов и их реакции. М.,1985 (разам з А.І.Ціняковай); Металлоорганический катализ в процессах полимеризации. 2 изд. М., 1985 (з ёй жа).

Літ.: Б.А.Долгоплоск (1905—1994): (К 90-летию со дня рождения) // Высокомолекулярные соединения. Сер. А. 1996. Т. 38, № 3.

ДАЛГАРУ́КАЎ Пётр Уладзіміравіч (8.1.1817, Масква — 18.8.1868), расійскі гісторык і публіцыст. Князь, з роду *Далгарукіх.* Скончыў Пажскі корпус (1834). Займаўся генеалогіяй: апублікаваў «Паданне пра род князёў Далгарукавых» (1840), «Расійскі радаслоўны зборнік» (кн. 1—4, 1840—41), «Расійскую радаслоўную кнігу» (ч. 1—4, 1854—57). Выдаў у Парыжы на франц. мове ў 1842 «Нататку пра галоўныя фаміліі Расіі», накіраваную супраць дынастыі Раманавых, за што быў засланы (1843—44), у 1860 кн. «Праўда пра Расію», дзе крытыкаваў урад і праграму ліберальна-канстытуцыйных рэформаў. Адмовіўся вярнуцца ў Расію і быў завочна прыгавораны Сенатам да пазбаўлення тытула, усіх маёмасных правоў і вечнага выгнання (1861). Выпускаў газ. канстытуцыйнага кірунку «Будущность», «Правдивый», «Листок» і інш. Супрацоўнічаў у газ. «Колокол» А.І.Герцэна. Аўтар мемуараў (1867).

Літ.: Эйдельман Н.Я. Герцен против самодержавия: Секретная полит. история России XVIII—XIX вв. и Вольная печать. 2 изд. М., 1984.

ДАЛГАРУ́КІ Юрый, гл. *Юрый Далгарукі.*

ДАЛГАРУ́КІЯ, Далгарукавы, расійскія ваен. і дзярж. дзеячы, прадстаўнікі стараж. княжацкага роду. Родапачынальнік — Міхаіл Усеваладавіч Чарнігаўскі. Мянушку Д. атрымаў яго патомак Іван Андрэевіч Абаленскі. Найб. вядомыя прадстаўнікі роду:

Юрый Аляксеевіч (? — 15.5.1682), баярын, ваявода. Блізкая асоба цара Аляксея Міхайлавіча. У час *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* удзельнічаў у заняцці Мсціслава, Дуброўны і Шклова, у паходзе ў Бел. Панямонне (1665). У 1658 прызначаны ваяводам у Мінску, Вільні. З 1660 галоўнакаманд. рас. войскамі на Беларусі. У 1671 кіраваў задушэннем паўстання на чале з С.Разіным у Паволжы. Забіты ў час Стралецкага паўстання 1682. Якаў Фёдаравіч (1639, Масква — 19.11.1720), баярын. Паплечнік, саветнік і давераная асоба Пятра I. Удзельнік Азоўскіх паходаў 1695—96. З 1712 сенатар, з 1717 прэзідэнт Рэвіз. калегіі. Рыгор Фёдаравіч (1656—26.8.1723), дыпламат. Удзельнік Азоўскіх паходаў 1695—96, Палтаўскай бітвы 1709. Пасол у Рэчы Паспалітай (1701—21). З 1721 сенатар. Васілій Уладзіміравіч (студз. 1667 — 22.2.1746), ген.-фельдмаршал (1728). Удзельнік Паўн. вайны 1700—21. У 1708 на Украіне кіраваў задушэннем Булавінскага паўстання. З 1721 сенатар. З 1730 чл. Вярх. тайнага савета. У 1731 арыштаваны па справе царэвіча Аляксея, у 1739 засланы ў Салавецкі манастыр. З 1741 вернуты са ссылкі, прызначаны прэзідэнтам Ваен. калегіі. Васіль Лукіч (каля 1670 — 19.11.1739), дыпламат. З 1706 пасол, пасланнік, паўнамоцны міністр у Рэчы Паспалітай, Даніі, Францыі, Швецыі. З 1728 чл. Вярх. тайнага савета. У 1730 засланы ў Салавецкі манастыр за ўдзел у змове «вярхоўнікаў». Пакараны смерцю. Юрый Уладзіміравіч (13.11.1740—20.11.1830), ген.-аншэф (1774). Удзельнік Сямігадовай вайны 1756—63, рус.-тур. войнаў (1768—74 і 1787—91) і інш. У 1789—90 каманд. корпусам на Беларусі, у 1793—94 нач. войск у далучаных да Расіі зямель Рэчы Паспалітай. Аўтар мемуараў. Іван Міхайлавіч (18.4.1764—16.12.1823), тайны саветнік (1804). Скончыў Маск. ун-т (1780). У 1791—97 віцэ-губернатар Пензы, у 1802—12 губернатар ва Уладзіміры. Аўтар мемуараў. Васіль Андрэевіч (7.3.1804—17.1.1868), ген.-ад'ютант (1845), ген. ад кавалерыі (1856). Удзельнік задушэння Наўгародскага паўстання ваен. пасялян (1830) і паўстання 1830—31. Ваен. міністр (з 1853), адначасова чл. Дзярж. савета. у 1856—66 гал. нач. «Трэцяга аддзялен-

ня» і шэф корпуса жандараў. З 1866 обер-камергер двара. Пётр Уладзіміравіч, гл. *Далгарукі* П.У.

ДАЛГІХ Уладзімір Віталевіч (н. 26.2.1969, г. Гродна), бел. артыст балета. Скончыў Бел. харэаграфічнае вучылішча (1987, педагог Л.*Чахоўскі*). З 1989 саліст Нац. акад. т-ра балета Беларусі. Творчасці Д. ўласцівы пластычная выразнасць, сэнсавая напоўненасць, тонкая псіхал. распрацоўка партый, высакародства і рамант. ўзнёсласць светаўспрымання яго герояў.

Сярод партый: Яраполк («Страсці» А.Мдывані, Дзярж. прэмія Рэспублікі Беларусь 1996), Прынц, Зігфрыд («Шчаўкунок», «Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Альберт («Жызэль» А.Адана), Джэймс («Сільфіда» Х.Левенскольда), Палемон («Ундзіна» Г.Генцэ), Паэт («Карміна Бурана» на муз. К.Орфа), Рамэо («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Адам («Стварэнне свету» А.Пятрова), Спартак («Спартак» А.Хачатурана).

Т.М.Мушынская.

ДАЛГО́Ў Іван Іванавіч (1857, Пецярбургская губ. — 18.10.1911), бел. гісторык, археолаг, краязнавец. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1880). З 1889 у Полацкім кадэцкім корпусе. Вывучаў гісторыю Полацка са стараж. часоў, даследаваў археал. помнікі Полаччыны і склаў іх рэестр. Напісаў гісторыю кадэцкага корпуса (1835—90-я г.) і быў адным з арганізатараў створанага ў ім музея. Правадз. член Віцебскай архіўнай камісіі. Удзельнік 9-га археал. з'езда (1893, Вільня).

Тв.: Прошлое и настоящее Белоруссии // Витебские губернские ведомости. 1897. № 19; Наш край // Там жа. 1898. № 113—114; Полоцкий кадетский корпус. Витебск, 1899.

Г.А.Каханоўскі.

ДАЛГУ́ШЫН Мікіта Аляксандравіч (н. 8.11.1938, С.-Пецярбург), рускі артыст балета, балетмайстар, педагог. Нар. арт. Расіі (1976). Нар. арт. СССР (1988). Д-р гуманітарных н. (1991). Скончыў харэаграфічнае вучылішча (1959) і кансерваторыю (1980) у Ленінградзе. У 1968—83 у Ленінградскім Малым т-ры оперы і балета. Майстар адточанага элегантнага танца. Сярод партый: Ферхад («Легенда аб каханні» А.Мелікава), Князь («Яраслаўна» Б.Цішчанкі), Джэймс («Сільфіда» Ж.Шнейцгофера), Рамэо («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева). Ставіў пераважна аднаактовыя балеты, дзе выконваў гал. партыі: «Канцэрт у белым» на муз. Чайкоўскага (1969), «Клітэмнестра» на муз. К.Глюка (1972) і інш. З 1983 выкладчык (з 1990 праф.) і кіраўнік балета Муз. т-ра С.-Пецярбургскай кансерваторыі. Сярод пастановак: «Кароль Лір» на муз. С.Насідзэ (1990, разам з Г.Алексідзэ; партыя караля Ліра), «Спячая прыгажуня» (1992) і «Шчаўкунок» (1994) Чайкоўскага і інш. Лаўрэат Міжнар. конкурсу артыстаў балета ў Варне (1964). Яго творчасці прысвечаны фільм «Мікіта Далгушын. Філасофія танца» (1992), тэлефільм «Танцуе Мікіта Далгушын» (1982).

ДАЛГУ́ШЫНЦЫ, члены рэв. народніцкага гуртка ў Расіі ў 1872—73, засн. А.В.Далгушыным у Пецярбургу (з 1873 у Маскве). Гурток аб'ядноўваў прадстаўнікоў інтэлігенцыі і рабочых, якія падзялялі погляды бакуністаў (гл. М.А.*Бакунін*). У 1873 стварылі падп. друкарню, дзе выдавалі агітац. брашуры, якія распаўсюджвалі сярод сялян і рабочых. Д. крытыкавалі грамадскі і дзярж. лад, прапаведавалі ідэі эканам. роўнасці, выбранага народам урада, падзелу зямлі і размеркавання яе «па справядлівасці» і інш. У ліп. 1874 Далгушын і 4 інш. чл. гуртка прыгавораны да катаргі, астатнія — да ссылкі. Д. — адна з першых спроб *«хаджэння ў народ»*.

ДАЛЕ́Н (Dalén) Нільс Густаў (30.11.1869, г. Стэнстарп, Швецыя — 9.12.1937), шведскі інжынер і вынаходнік. Чл. Шведскай каралеўскай акадэміі (1913), Шведскай акадэміі навук і тэхнікі (1919). Скончыў Ін-т Чалмерса ў г. Гётэбарг (1896). Працаваў у шведскіх кампаніях (карбідна-ацэтыленавай, газавых акумулятараў). Даследаваў паветр. турбіны і помпы, кампрэсары. Распрацаваў газавы акумулятар, эфектыўную печ, вынайшаў аўтам. рэгулятар для крыніц святла на маяках і буях (запальвалі ацэтыленавае полымя з наступленнем цемнаты і гасілі на світанні). Нобелеўская прэмія 1912.

«ДАЛЕ́НГА», прыватнаўласніцкі герб. У блакітным полі сярэбраная падкова, з сярэдзіны падковы выходзіць страла джалам уніз, над падковай — залаты крыж; клейнод — прабітае стралой птушынае крыло. Існуюць варыянты герба: страла накіравана ўлева, клейнод — 3 страусавыя пёры. Паводле падання, узнік у канцы 12 ст. У ВКЛ пашыраны з пач. 15 ст. Гербам карысталіся больш за 150 родаў Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны.

А.К.Цітоў.

ДАЛЕ́НГА-ХАДАКО́ЎСКІ Зарыян Якаўлевіч (сапр. Чарноцкі Адам; 24.12.1784, каля в. Гайна Лагойскага р-на Мінскай вобл. — 17.11.1825), славяназнавец, пачынальнік бел., польск., рус. і ўкр. археалогіі, фальклярыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Чл.-кар. варшаўскага Т-ва сяброў навук (1819), чл. пецярбургскага Вольнага т-ва аматараў расійскай славеснасці (1819), маскоўскага Т-ва гісторыі і старажытнасцей расійскіх (1820). Працаваў у Мінску прыватным адвакатам, у 1814—18 у б-цы Крамянецкага ліцэя, б-цы апекуна Віленскай навуч. акругі А.Чартарыйскага ў Пулавах (Люблінскае ваяв.) і інш., у мінскіх архівах вывучаў стараж. бел. акты і граматы. Падарожнічаў па Польшчы, Галіцыі, Палессі. Даследаваў гарадзішчы ў Полацку, Віцебску, Тураве, Бабруйскім пав., каля Брэста, Гомеля, Магілёва, в. Старое Сяло Віцебскага пав., запісваў фальклор, дыялектную лексіку, абрады. У 1820—21 збіраў і вывучаў археал., дыялектны, этнагр. і фальклорны матэрыял на Поўначы Расіі. Найб. значная яго праца «Пра славяншчыну да хрысціянства» (1818), у якой упершыню зрабіў спробу апісаць стараж.-славянскі побыт, культуру і нар. творчасць у дахрысціянскі перыяд, намеціў праграму комплексных даследаванняў слав. і суседніх народаў. У «Даследаваннях адносна рускай гісторыі» (1819) крытыкаваў некат. палажэнні «Гісторыі дзяржавы Расійскай» М.Карамзіна, удакладніў факты, звязаныя з гісторыяй Беларусі (у наступных выданнях Карамзін улічыў іх). У «Праекце вучонага падарожжа па Расіі для вытлумачэння старажытнай славянскай гісторыі» (1820) і «Гістарычнай сістэме Хадакоўскага» (апубл. 1838) абгрунтаваў археал. тэорыю гарадзішчаў, прынцыпы збору фальклору і дыялектнай лексікі, упершыню ў славістыцы паказаў ролю тапанімікі для гіст. даследаванняў, склаў рэестр агульнаслав. тапонімаў (у т.л. беларускіх), вызначыў тэр. пашырэння бел. мовы. Большасць яго прац не апублікавана: збор бел. (каля 500) і рус. песень, запісы замоў, загадак, слоўнікі, матэрыялы па слав. этнаграфіі, дыялекталогіі, тапаніміцы, археалогіі. Фальклорная спадчына Д.-Х. — самы багаты збор твораў слав. нар. паэзіі таго часу як па колькасці запісаў, так і па рэгіёну збірання. Гэта першая спроба сістэматычнага, свядомага запісвання (з элементамі навук. пашпартызацыі) слав. фальклору ў яго жанравай разнастайнасці. Яго навук. і збіральніцкая дзейнасць была ўзорам і праграмай для навук. аб'яднанняў Беларусі, Украіны, Польшчы і Расіі. Многія славяназнаўчыя праблемы (слав. этнагенез, прарадзіма славян), вылучаныя ім, актуальныя і сёння.

Тв.: O Sławiańszczyźnie przed chrześcjaństwem oraz inne pisma i listy. Warszawa, 1967; Śpiewy sławiańskie pod strzechą wiejską zebrane. Warszawa, 1973; Українські народні пісні в записах Зоріана Доленги-Ходаковського. Київ, 1974.

Літ.: Аксамітаў А.С., Малаш Л.А. З душой славяніна: Жыццё і дзейнасць З.Я.Даленгі-Хадакоўскага. Мн., 1991; Аксамітаў А. Ля вытокаў беларускага мовазнаўства: Са спадчыны Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага // Роднае слова. 1992. № 5; Maślanka J. Zorian Dołęga Chodakowski. Wrocław etc., 1965.

Л.А.Малаш-Аксамітава.

ДАЛЕ́ЎСКІЯ, удзельнікі вызв. руху ў Беларусі і Літве ў сярэдзіне 19 ст. і паўстання 1863—64. Дзеці дробнага шляхціца Дамініка Далеўскага, які валодаў фальваркам Кункулка ў Лідскім пав.

Францішак (1825, фальварак Руднікі Лідскага пав. — 25.4.1904), адзін са стваральнікаў *Братняга саюза літоўскай моладзі*. У 1849—60 у турме, на катарзе і ў ссылцы ў Сібіры. Напярэдадні і ў час паўстання адзін з кіраўнікоў партыі *«белых»*, чл. *Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы*. У чэрв. 1863 арыштаваны, засуджаны на 20 гадоў катаргі. З 1883 у Варшаве.

Аляксандр (24.1.1827, Кункулка — 26.4.1862), адзін са стваральнікаў Братняга саюза літоўскай моладзі. У

1849 арыштаваны, у 1850—58 на катарзе, у сібірскай ссылцы. Памёр у Вільні ад сухотаў неўзабаве пасля вяртання на радзіму.

Канстанцін (1837, Кункулка — 27.5.1871). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це, каморнік. Удзельнік паўстання 1863—64 на Ковеншчыне — змагаўся ў атрадах З.*Серакоўскага*, І.Ляскоўскага, А.Мацкявічуса, камандаваў асобным атрадам, паранены. Потым у эміграцыі. У час Парыжскай камуны 1871 расстраляны версальцамі.

Цітус (13.5.1840, Кункулка — 11.1.1864), удзельнік рэв. студэнцкага руху ў Маскве і Пецярбургу, дзе вучыўся ва ун-тах. З лета 1863 найбліжэйшы памочнік К.*Каліноўскага* па кіраўніцтве паўстаннем. Арыштаваны, публічна расстраляны на Лукішскай плошчы ў Вільні.

Апалонія (1841, Кункулка — пасля 1915), жонка Серакоўскага. У час паўстання 1863—64 выслана ў Ноўгарад. З 1867 у Варшаве, займалася грамадскай дзейнасцю. Аўтар успамінаў пра паўстанне.

Г.В.Кісялёў.

ДАЛЁКАДЗЕ́ЯННЕ, канцэпцыя, паводле якой *узаемадзеянні* паміж аддаленымі матэрыяльнымі аб'ектамі перадаюцца імгненна праз пустату на колькі пажадана вялікія адлегласці. Існавала ў механіцы Ньютана. Адкрыццё эл.-магн. поля (1860—80-я г.) паказала, што канцэпцыя Д. памылковая. Гл. таксама *Блізкадзеянне*.

ДАЛЁКАЎСХО́ДНІ МАРСКІ́ ЗАПАВЕ́ДНІК. У зал. Пятра Вялікага, у Прыморскім краі Расійскай Федэрацыі. Засн. ў 1978 з мэтай захавання каштоўных відаў рыб, шматлікія беспазваночныя, каля 800 відаў водарасцей). Пл. больш за 64 тыс. га, у т.л. каля 63 тыс. га акваторыі. Уваходзіць 9 астравоў, 3 асн. ўчасткі. Архіпелаг Рымскага-Корсакава — зона поўнай запаведнасці, зал. Пасьета і в-аў Фуругельма — участак узнаўлення (аквакультура трэпанга, грабеньчыка, гіганцкай вустрыцы), в-аў Папова — музей прыроды мора і яе аховы.

ДАЛЁКАЎСХО́ДНЯЯ РЭСПУ́БЛІКА, дзяржава на тэр. Усх. Сібіры і Д.Усходу ў 1920—22. Створана паводле рашэння ЦК РКП(б) з мэтай прадухіліць нападу Японіі на РСФСР і забяспечыць умовы для ліквідацыі яп. інтэрвенцыі і белагвардзейскага руху на Д.Усходзе. Абвешчана 6.4.1920 на Устаноўчым з'ездзе працоўных Прыбайкалля. Уключала Забайкальскую, Амурскую, Прыморскую, Камчацкую вобласці і Паўн. Сахалін. Сталіца — Верхнеудзінск (цяпер Улан-Удэ), з 10.11.1920 — Чыта. Прызнана сав. урадам 14.5.1920. У маі 1921 белагвардзейцы пры падтрымцы яп. інтэрвентаў захапілі ўладу ва Уладзівастоку, у снеж. 1921 — у Хабараўску. Пасля заняцця часцямі Нар.-рэв. арміі рэспублікі (камандз. В.К.*Блюхер*) Хабараўска (14.2.1922), Уладзівастока (25.10.1922) і інш. Японія эвакуіравала свае войскі.

Літ.: Сонин В.В. Становление Дальневосточной республики, 1920—1922. Владивосток, 1990.

ДАЛЁКАЎСХОДНЯЯ САРДЗІНА, гл. *Івасі*.

ДАЛЁКАЯ СУ́ВЯЗЬ, міжгароднняя сувязь, від тэлефонна-тэлеграфнай сувязі паміж карэспандэнтамі, якія знаходзяцца на далёкай (практычна неабмежаванай) адлегласці адзін ад аднаго. Адначасовая перадача тэлеф., тэлегр., фотатэлегр., тэлевізійных і інш. сігналаў ажыццяўляецца па паветраных, кабельных, радыёрэлейных, спадарожнікавых і інш. лініях сувязі (гл. *Многаканальная сувязь*). Для кампенсацыі затухання сігналаў на асобных участках ліній устанаўліваюць узмацняльныя пункты або прамежкавыя (рэтрансляцыйныя) станцыі.

ДАЛЁКІ І БЛІ́ЗКІ ПАРА́ДАК, упарадкаванасць мікраструктуры рэчыва на міжатамных (блізкі парадак) ці на неабмежавана вял. адлегласцях (далёкі парадак). Бывае каардынацыйны — у размяшчэнні часціц рэчыва (існуе ў *крышталях*; у вадкасцях і аморфных цвёрдых целах — толькі блізкі парадак); арыентацыйны — у арыентацыі часціц (у *вадкіх крышталях*; у вадкасцях з несіметрычных малекул — блізкі парадак); магнітны — у арыентацыі магн. момантаў (у *ферамагнетыках*, *ферымагнетыках*, *антыферамагнетыках*); у арыентацыі эл. дыпольных момантаў (у *сегнетаэлектрыках*). Існаванне Д. і б.п. абумоўлена ўзаемадзеяннем паміж часціцамі; асн. прыкмета — *сіметрыя крышталёў*. Ступень упарадкавання можна мяняць цеплавой, мех. і інш. апрацоўкамі, пры гэтым мяняюцца фіз. ўласцівасці рэчыва.

Літ.: Уайт Р., Джебелл Т. Дальний порядок в твердых телах: Пер. с англ. М., 1982.

Л.М.Шахлевіч.

ДАЛЁКІ УСХО́Д, агульная назва дзяржаў і тэрыторый на У Азіі. Адносяць крайнюю ўсх. ч. Расійскай Федэрацыі [Прыморскі і Хабараўскі краі, Амурская, Камчацкая, Магаданская і Сахалінская вобл., а таксама ўсх. ч. Рэспублікі Саха (Якуція) і Чыцінскай вобл.], усх. ч. Кітая, Карэю (Карэйскую Нар.-Дэмакр. Рэспубліку і Рэспубліку Карэя), Японію, зрэдку і Філіпіны.

ДАЛЁКІЯ, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 27 км на ПдЗ ад Браслава, 247 км ад Віцебска, 51 км ад чыг. ст. Гадуцішкі. 460 ж., 184 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Станіслаўскі касцёл (1-я пал. 20 ст.). Каля вёскі курганны могільнік 8—11 ст.

ДАЛЖО́НАК Арэст Васілевіч (н. 7.5.1935, в. Падомхі Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. дзеяч самадз. мастацтва, харавы дырыжор. Засл. работнік культ. Беларусі (1980). Скончыў Маладзечанскае муз. вучылішча (1963). З 1963 кіраўнік Казловіцкага нар. хору цэнтр. Дома культуры Слуцкага р-на, аднаго з лепшых самадз. хар. калектываў. Бераўліва ставіцца да нар. песні, імкнецца захаваць яе ў блізкім да аўтэнтычнага выглядзе. Аўтар песень «Беларусі юбілейнай», «Наш край случанскі» і інш.

ДАЛІ́ (Dali) Сальвадор (11.5.1904, г. Фігерас, Іспанія — 23.1.1989), іспанскі жывапісец, графік і тэарэтык мастацтва; адзін з заснавальнікаў і вядучы прадстаўнік *сюррэалізму*. Вучыўся ў АМ у Мадрыдзе (1921—26), захапляўся футурызмам, кубізмам, метафіз. жывапісам. З 1929 у Парыжы, дзе пад уплывам П.*Пікасо* і А.*Брэтона* склаўся як сюррэаліст. Абапіраючыся на тэорыю псіхааналізму З.Фрэйда, стварыў уласны творчы метад, які назваў «паранаістычна-крытычным». Свае ідэі сцвердзіў у першых сюррэаліст. фільмах, зробленых у супрацоўніцтве з Л.*Буньюэлем* («Андалускі пёс», 1929, і «Залаты век», 1931), што прынесла Д. славу самага эксцэнтрычнага і экстравагантнага мастака 20 ст. Жывапісныя творы Д., адметныя нястрыманай фантазіяй і віртуознай тэхнікай, як правіла, уяўляюць сабой фантасмагорыі, дзе самым ненатуральным сітуацыям і спалучэнням прадметаў надаецца знешняя дакладнасць і пераканаўчасць: «Пастаянства памяці», «Старасць Вільгельма Тэля» (абодва 1931), «Архітэктанічны «Анжэлюс» Міле» (1933), «Прадчуванне грамадзянскай вайны» (1936), «Сон Хрыстафора Калумба» (1959), «Лоўля тунца» (1967) і інш. З 1940 у ЗША, дзе яго ілюзійны прыём жывапісу дасягнуў найб. вастрыні («Сон, выкліканы палётам пчалы вакол граната за хвіліну да абуджэння», 1944, «Атамная Леда», 1949). З 1955 у Іспаніі, пад уплывам ісп. барочнага жывапісу ствараў творы хрысц. тэматыкі

С.Далі. Архітэктанічны «Анжэлюс» Міле. 1933.

«Тайная вячэра», 1955, і інш.). Займаўся сцэнаграфіяй, плакатам, дэкар. мастацтвам, ілюстраваў творы М.Сервантэса, У.Шэкспіра і інш. Аўтар аўтабіягр. кніг «Тайнае жыццё Сальвадора Далі» (1942—1944) і «Дзённік генія» (1964). У 1972 у Фігерасе адкрыты музей мастака, у якім ён і пахаваны.

Тв.: Рус. пер. — Дневник одного гения. М., 1991. *Я.Ф.Шунейка.*

«ДАЛІ́ВА», прыватнаўласніцкі герб. У блакітным полі сярэбраная перавязь з левага верхняга кута ў ніжні правы, на перавязі 3 чырвоныя 4-пялёсткавыя (або 5-пялёсткавыя) ружы; клейнод — 2 чорныя валовыя рагі, паміж імі 3 пастаўленыя адна над адной ружы. Існуе варыянт герба: поле чырвонае. Паводле падання, узнік у пач. 11 ст. У ВКЛ існаваў з пач. 15 ст. Гербам карысталіся больш за 130 шляхецкіх родаў Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны. *А.К.Цітоў.*

ДАЛІ́ВА-ДАБРАВО́ЛЬСКІ Міхаіл Восіпавіч (2.1.1862, С.-Пецярбург — 15.11.1919), расійскі інжынер-вынаходнік у галіне электратэхнікі. Скончыў Дармштацкае вышэйшае тэхн. вучылішча (1884, Германія). Працаваў на электратэхн. з-дах у Германіі. Стварыў асн. часткі сістэмы трохфазнага току: генератар з вярчальным магнітным полем (1888), асінхронны электрарухавік (1889), трансфарматар (1890), сканструяваў фазометр, дзельнік напружання, пускавыя рэастаты і інш. электравымяральныя прылады. Упершыню ажыццявіў перадачу эл. энергіі трохфазнага пераменнага току на адлегласць (каля 170 км; 1891).

Тв.: Избр. труды (о трехфазном токе). М.; Л., 1948.

Літ.: Веселовский О.Н. Доливо-Добровольский. М., 1963.

ДАЛІ́ДЗЕ Сямён Вісарыёнавіч (6.2.1903, г. Махарадзе, Грузія — 17.6.1983), грузінскі кінарэжысёр і сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1965). Скончыў Тбіліскі ун-т (1925). Сярод фільмаў: «Апошнія крыжаносцы» (1934), «Дарыко» (1937), «Шчыт Джургая» (1944, разам з Д.Рандэлі), «Страказа» (1954), «Фаціма» (1959), «Дзень апошні, дзень першы» (1960), «Горад прачынаецца рана» (1968), «Сады Семіраміды» (1971), «Кукарача» (1983). Дзярж. прэмія СССР 1950.

ДАЛІДО́ВІЧ Аляксандр Ільіч (2.8.1914, в. Ямнае Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 24.9.1952), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941. Камандзір аддзялення разведкі сяржант Д. вызначыўся 21.6.1944 каля г. Ладзейнае Поле Ленінградскай вобл. пасля пераправы цераз р. Свір, 18.3 і 4.4.1945 у баях на тэр. Германіі.

ДАЛІДО́ВІЧ Генрых Вацлававіч (н. 1.6.1946, в. Янкавічы Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1968). Настаўнічаў. З 1973 у час. «Полымя», з 1979 нам. гал. рэдактара, з 1991 гал. рэдактар час. «Маладосць». Друкуецца з 1966. Першы зб. апавяданняў «Дажджы над вёскай» (1974). Творы Д. адметныя лірызмам, увагай да побытавых дэталей, дакладным псіхалагізмам. У рамане «Гаспадар-камень» (1984, Літ. прэмія імя І.Мележа 1987), прысвечаным пярэдадню 1-й сусв. вайны, шматбакова паказаў жыццё тагачасных вёскі і горада, няпростыя шляхі нац. інтэлігенцыі, у якой расло ўсведамленне свайго абавязку. У раманах «Пабуджаныя» (1988) і «Свой дом» (1989) побач з героямі, вядомымі з «Гаспадара-каменя», шмат новых персанажаў — удзельнікаў і кіраўнікоў паліт. руху розных кірункаў на Беларусі ў 1917—18. У рамане «Заходнікі» (1992, Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1996) створана панарамная карціна жыцця зах.-бел. сялянства і інтэлігенцыі пачынаючы з канца 1940-х г., іх «перавыхаванне», рэпрэсіі, міграцыі. Выступае з літ.-крытычнымі і публіцыст. артыкуламі. На бел. мову пераклаў раман Дж.Ф.Купера «Апошні з магікан».

М.В.Даліва-Дабравольскі.

Г.В.Далідовіч.

Тв.: Цяпло на першацвет. Мн., 1976; Маладыя гады. Мн., 1979; Міланькі. Мн., 1980; На новы парог. Мн., 1983; Станаўленне. Мн., 1985; Міг маладосці. Мн., 1987; Жывы покліч. Мн., 1995; Жар кахання. Мн., 1996; Кліч роднага звона. Мн., 1997.

Літ.: Савік Л. Адчуванне часу. Мн., 1981. С. 159—165; Андраюк С. Жыць чалавекам. Мн., 1983; Тычына М. Змена квадры. Мн., 1983. С. 124—125, 129—133, 155—156. *А.У.Рагуля.*

ДАЛІ́ЛА, Даліда, у біблейскай міфалогіі філістымлянка, каханка стараж.-яўр. героя Самсона. Выведаўшы, што неадольная сіла Самсона ў яго валасах, усыпіла юнака, загадала астрыгчы яму валасы, а пасля выдала Самсона ворагам-філістымлянам. На міф пра Д. і Самсона напісаны карціны А.Мантэння, А.Джэнтылескі, опера К.Сен-Санса і інш.

ДАЛІ́НА АЗЁР, міжгорная ўпадзіна паміж Габійскім Алтаем і Хангаем, на ПдЗ Манголіі. Даўж. каля 500 км, шыр. да 100 км. Выш. 1000—1400 м. Днішча ўпадзіны — ланцуг замкнёных катлавін, складзеных з рыхлых адкладаў і падзеленых узгоркамі і скалістымі градамі. Шматлікія бяссцёкавыя азёры (Бонцаган-Нур, Арог-Нур і інш.). Пераважаюць апустыненыя ландшафты: кучавыя пяскі, саланчакі, такыры.

ДАЛІ́НА МГГ, паніжэнне ледавіковай паверхні ва Усх. Антарктыдзе, паміж плато Савецкім і зал. Прудс. Даўж. каля 1000 км, шыр. амаль 600 км. Паступова павышаецца ад м. Садружнасці да Полюса адноснай недаступнасці да выш. 2500—2800 м. На Пн частка даліны ўтворана *Ламберта ледавіком*. Названа ў гонар Міжнар. геафіз. года (МГГ, 1957—58).

ДАЛІ́НА ПРАРЫ́ВУ, гл. *Скразная даліна*.

ДАЛІ́НА СМЕ́РЦІ (Death Valley), міжгорная бязводная ўпадзіна на ПдЗ ЗША (штат Каліфорнія), у пустыні Махаве. Даўж. з ПнЗ на ПдУ каля 250 км. Адна з найб. глыбокіх (85 м ніжэй узр. м.) і бязводных упадзін на Зямлі, самае нізкае месца Паўн. Амерыкі. Абс. максімум т-ры паветра 56,7 °С (самая высокая ў Зах. паўшар'і). Назва звязана з золаташукальнікамі, якія загінулі тут у 1849 ад недахопу вады. Нацыянальны помнік прыроды (1933).

Даліна цароў. Насценная размалёўка грабніцы фараона.

ДАЛІ́НА ЦАРО́Ў, скалістая раўніна ў зах. пустыні насупраць г. Фівы на Ніле (Верхні Егіпет). У перыяд Новага царства тут размяшчаўся царскі некропаль (з 1580 да н.э.). Грабніцы фараонаў высякаліся ў вапняку, кожнай з іх на беразе Ніла адпавядаў храм, дзе здзяйсняліся абрады, неабходныя для замагільнага дабрабыту цароў. Адкрыццё ў 1922 неразрабаванай грабніцы *Тутанхамона* ўпершыню прадэманстравала раскошу абсталявання падобных грабніц.

ДАЛІ́НАЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА ГЛІН І СУГЛІНКАЎ, у Гродзенскай вобл., за 6,5 км на ПнЗ ад г.п. Дзятлава. Пластавы паклад звязаны з марэннымі адкладамі сожскага ледавіка. Гліны і суглінкі светла- і жаўтавата-шэрыя, шчыльныя, вязкія, пластычныя, карбанатныя, з зернямі жвіру. Разведаныя запасы 4,2 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы

3,1—15,7 м, ускрышы 0,3—8 м. Гліны і суглінкі прыдатныя на выраб аглапарыту.

ДАЛІ́НЫ, рачныя даліны, адмоўныя, лінейна выцягнутыя формы рэльефу з агульным нахілам ад вярхоўяў да нізоўяў, утвораныя ў выніку размыўнай (эразійнай) дзейнасці цякучай вады; многія маюць тэктанічнае паходжанне. Папярочны профіль рачных Д. у залежнасці ад стадыі развіцця геал. будовы мясцовасці і інш. фактараў можа мець V-, U-, скрыне-, карытападобную і інш. формы; пачатковая форма Д. — яры і лагчыны. Д. звычайна ўключаюць *рэчышча, пойму, тэрасы, схілы*, каля вусця часам фарміруюцца *дэльты* або конусы вынасу.

Асн. працэсы ў развіцці Д. — глыбінная і бакавая эрозія, акумуляцыя адкладаў. Профіль Д. амаль заўсёды асіметрычны, што абумоўлена геал. будовай, нахілам паверхні, *Карыяліса сіламі*, дзеяннем грунтавых вод і інш. У плане Д. маюць клінападобную, меандрычную, пацеркападобную, прамалінейную, каленчатую форму. У вярхоўі Д. звычайна замыкаюцца схіламі, утвараючы вадазборную варонку, ледавіковы цырк (у гарах) або застаюцца адкрытымі і пераходзяць у вярхоўе суседніх Д. У адносінах да распасціравання структур і горных хрыбтоў вылучаюць падоўжныя (сінклінальныя, антыклінальныя, моноклінальныя, скідавыя Д. і Д.-грабены), папярочныя і дыяганальныя. Калі Д. праразае горны хрыбет ці ўзвышша, на ўсю шырыню ўтвараецца *скразная даліна*, або Д. прарыву. Паводле марфалогіі адрозніваюць горныя Д. (глыбокія і нешырокія са стромкімі схіламі) і раўнінныя Д. (звычайна шырокія, з нязначнымі нахіламі, глыбінёй і стромкасцю схілаў). Памеры залежаць ад мінулай ці сучаснай дзейнасці цякучай вады. Найб. значныя Д. пашыраны ў раёнах з вял. колькасцю ападкаў.

На Беларусі Д. займаюць каля 10% тэр. Выкарыстоўваюцца пад сенажаці і с.-г. культуры, да іх прымеркаваны шматлікія меліярац. сістэмы. *Л.У.Мар'іна.*

ДАЛІМА́ТАЎ (сапр. Лучыч Васіль Панцеляймонавіч; 1852, вобл. Далмацыя, Югаславія — 27.2.1912), рускі акцёр. Сцэн. дзейнасць пачаў у Адэсе. У 1873—76 у Маск. агульнадаступным т-ры, у 1880—84 у маскоўскіх т-рах Пушкінскім і Ф.Корша, у 1884—94 і з 1901 у Александрынскім т-ры (Пецярбург). Яго мастацтва вызначалася высокай культурай, філіграннай дакладнасцю, уменнем ствараць тыповыя вобразы. Сярод роляў: Гамлет, Макбет, кароль Лір (аднайм. п'есы У.Шэкспіра), Іаан («Смерць Іаана Грознага» А.К.Талстога), Агішын («Жаніцьба Бялугіна» А.Астроўскага і М.Салаўёва), Крачынскі («Вяселле Крачынскага» А.Сухава-Кабыліна), Ракіцін, граф Любін («Месяц у вёсцы», «Правінцыялка» І.Тургенева). Аўтар п'ес, фельетонаў, апавяданняў і аповесцей з тэатр. жыцця.

ДАЛМАЦЫ́НСКІЯ АСТРАВЫ́, архіпелаг (больш за 1000 астравоў) у Адрыятычным м., тэр. Харваты. Пл. каля 2500 км^2. Самыя вял. а-вы: Крк, Брач, Црэс, Хвар, Корчула. Утварыліся пры затапленні морам часткі берагавой паласы. Узгорысты і нізкагорны рэльеф, выш. да 778 м (на в-ве Брач). Складзены пераважна з вапнякоў, развіты карст. Клімат і расліннасць міжземнаморскія. Вінаграднікі, сады, плантацыі цытрусавых, аліўкаў. Нац. паркі: Корнат, Млет. Марскія курорты. Турызм.

ДАЛМА́ЦЫЯ (Dalmacija), гістарычная вобласць на Адрыятычным узбярэжжы Балканскага п-ва (разам з Далмацінскімі а-вамі) на тэр. Харваты і Чарнагорыі. У старажытнасці была населена ілірыйскімі плямёнамі далматаў (адсюль назва), на прылеглых астравах з 4 ст. да н.э. існавалі грэчаскія гандл. калоніі. У 168—155 да н.э. і пазней заваявана рымлянамі, з 9 н.э. рым. правінцыя з цэнтрам у раёне сучаснага г. Спліт. З 395 у складзе Зах. Рым. імперыі, з 489 у дзяржаве остготаў, з 535 пад уладай Візантыі. У 6—7 ст. заселена славянамі, пазней прынята хрысціянства. У 9—10 ст. пад уладай Харвацкай дзяржавы, з 1102 у Венгерскім каралеўстве. У 12 — пач. 15 ст. росквіт сяродневяковых гарадоў-камун (Задар, Спліт, *Дуброўнік*, Котар і інш.). У 1420—1797 Д. (акрамя *Дуброўніцкай рэспублікі*) — уладанне Венецыі (у 16 ст. ўнутр. раёны Д. заваяваны туркамі), у 1797—1918 — Аўстрыі (у 1806—13 было падпарадкавана Францыі, у т.л. ў складзе *Ілірыйскіх правінцый* з 1809). З 1918 Д., акрамя гарадоў Задар (Зара), Рыека (Фіуме) і некалькіх астравоў, якія ўвайшлі ў склад Італіі, у Каралеўстве сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія). У 2-ю сусв. вайну б.ч. Д. анексіравана Італіяй (1941). З 1945 у складзе Харваты (асн. частка) і Чарнагорыі (крайні Пд).

Літ.: Фрейденберг М.М. Деревня и городская жизнь в Далмации XIII—XV вв. Калинин, 1972.

ДАЛО́ (Dollo) Луі (7.12.1857, г. Ліль, Францыя — 19.4.1931), бельгійскі палеантолаг. Замежны чл.-кар. АН СССР (1928). Вучань і паслядоўнік У.А.*Каваленскага*. Праф. Брусельскага ун-та і хавальнік Прыродазнаўча-гіст. музея. Адкрыў «закон неабарачальнасці эвалюцыі» (закон Д., 1893). Вывучаў марфал. асаблівасці выкапнёвых пазваночных. Асн. праца «Эталагічная палеанталогія» (1909) прысвечана выкарыстанню эталагічнага метаду пры вывучэнні выкапнёвых рыб, дыназаўраў і некат. млекакормячых.

ДАЛУ́ (Dalou) Эмэ Жуль (31.12.1838, Парыж — 15.4.1902), французскі скульптар. Вучыўся ў Ж.Б.*Карпо*. Удзельнік Парыжскай камуны 1871 (абраны хавальнікам Луўра); пасля яе падзення выехаў у Вялікабрытанію, дзе і жыў да амністыі 1879. Творы Д. адметныя цікавасцю да жыцця і перажыванняў простых людзей, яснай і энергічнай пластычнай мовай рэалістычнай скульптуры: «Брэтонка» і тэматычны рэльеф «Мірабо адказвае маркізу Дро-Брэзэ» (абодва 1884), 54 фігуры рабочых і сялян для праекта «Помнік Працы» (1889—92). Аўтар манум. кампазіцыі «Трыумф Рэспублікі» (1879—99).

Ж.Далу. Помнік Рэспублікі ў Парыжы. 1883.

Літ.: Бродский В. Художники Парижской Коммуны. М., 1970.

ДАЛУХА́НАВА Зара (Заруі Агасьеўна; н. 5.3.1918, Масква), армянская спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. Арменіі (1955). Нар. арт. Расіі (1956). Нар. арт. СССР (1990). Скончыла Муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (1957). З 1972 выкладае ў Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных (праф. з 1983). З 1939 салістка Армянскага т-ра оперы і балета, з 1944 — Усесаюзнага радыё, у 1959—82 — Маскоўскай філармоніі. Яе рэпертуар уключае шматлікія творы кампазітараў 16—

20 ст., у т.л. І.С.Баха, Г.Ф.Гендэля, Ф.Шуберта, Р.Шумана, Х.Вольфа, Г.Малера. Упершыню выканала шэраг твораў Дз.Шастаковіча, С.Пракоф'ева, Р.Шчадрына, М.Тарывердыева і інш. Удзельнічала ў канцэртных пастаноўках опер «Італьянка ў Алжыры» Дж.Расіні, «Сястра Анджэліка» Дж.Пучыні. Дзярж. прэмія СССР 1951. Ленінская прэмія 1966.

ДАЛУЧЭ́ННЕ ЗЯМЕЛЬ БЕЛАРУ́СІ ДА РАСІ́ЙСКАЙ ІМПЕ́РЫІ. Ажыццёўлена ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй у 1772, 1793 (без Аўстрыі) і 1795 (пра кожны падзел гл. асобны арт.). Расія набыла пераважна землі Беларусі, Левабярэжнай Украіны, Літвы пл. 41 млн. дзес. з 3,8 млн. чал. Бел. землі ў 1802 атрымалі ўстойлівы адм.-тэр. падзел: Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская губ. (пра кожную губ. гл. асобны арт.). Вышэйшую ўладу на месцах узначальвалі губернатары і ген.-губернатары. Калегіяльным органам пры губернатару было *губернскае праўленне*. Сістэма суд. органаў улады будавалася адпаведна Устанаўленню для кіравання губернямі 1775 з захаваннем саслоўнасці іх прадстаўніцтва. Паліт. правы паноў (памешчыкаў-прыгонніка ў) і шляхты размяжоўваліся і абмяжоўваліся. З 1772 праводзіўся *разбор шляхты*. З 1773 да выбараў на судовыя пасады дапускаліся толькі асобы, якія мелі больш за 20 прыгонных; пазней былі забаронены самавольныя шляхецкія сходы (ранейшыя сеймікі). Антырус. настроі шляхты прывялі да *паўстання 1794*. У ходзе рэвізіі 1772, 1782, 1795 і інш. былі запрыгонены катэгорыі раней вольных людзей (*выбранцы*, *зямяне* і інш.). У рэліг. палітыцы быў дэкларавана прынцып талерантнасці, захаваны ордэн *езуітаў* (скасаваны ў 1773 ва ўсім астатнім свеце), у 1782—83 створана Магілёўская рымска-каталіцкая архіепархія. Спробы ў 1780—82 і 1795 правесці уніятаў у праваслаўе мелі толькі частковы поспех з-за непадрыхтаванасці і матэр. незабяспечанасці гэтай акцыі. Уніяты пераведзены ў праваслаўе у выніку *Полацкага царкоўнага сабору 1839*. У 1791 далучаныя тэрыторыі ўключаны ў мяжу яўр. аселасці; яўрэям забаранялася пакідаць гэтыя тэрыторыі для пасялення і гандлю ў глыбі Расіі. Паводле Тыльзіцкага міру 1807 у склад Рас. імперыі ўвайшла Беласточчына (у ліп. 1808 утворана *Беластоцкая вобласць*).

Я.К.Анішчанка.

ДАЛУЧЭ́ННЯ РЭА́КЦЫІ, хімічныя рэакцыі аб'яднання 2 малекул з утварэннем аднаго новага злучэння. Найб. пашыраны Д.р. паміж рэчывамі, што маюць *кратныя сувязі*, і вадародам (*гідрагенізацыя*), галагенавадародамі (гідрагалагенаванне) і інш. рэагентамі. Характэрныя для *ненасычаных злучэнняў*. Выкарыстоўваюцца ў арган. сінтэзе (напр., прамысл. атрыманне хларапрэну гідрахлараваннем вінілацэтылену).

ДАЛЬ Алег Іванавіч (25.5.1941, Масква — 3.3.1981), рускі акцёр. Скончыў Тэатр. вучылішча імя Шчэпкіна (1963). Працаваў у Маск. т-ры «Сучаснік» (да 1977), у 1977—78 у Маск. т-ры на Малой Броннай. Яго мастацтва вызначалася абвостранасцю эмацыянальных рэакцый, інтэнсіўнасцю перажыванняў. Сярод роляў: Васька Пепел («На дне» М.Горкага), Бяляеў («Месяц у вёсцы» І.Тургенева). З 1962 здымаўся ў кіно: «Жэня, Жэнечка і «кацюша», «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка», «Старая, старая казка», «Кароль Лір», «Цень», «Зямля Саннікава», «Прыгоды прынца Фларызеля» (тэлевізійны), «Старонкі дзённіка Пячорына» (тэлеспектакль) і інш.

Літ.: Олег Даль: Воспоминания. Материалы из архива. М., 1992.

ДАЛЬ Уладзімір Іванавіч (22.11.1801, г. Луганск, Украіна — 4.10.1872), рускі лексікограф, этнограф, пісьменнік. Чл.-кар. Пецярбургскай АН. Скончыў мед. ф-т Дэрпцкага ун-та (Тарту, 1829), быў ваен. урачом. Даследаваў мову і побыт рус. народа. Аўтар прац «Пра гаворкі рускай мовы» (1852), «Прыказкі рускага народа» (1861—62, частку працы Д. бел. фальклярыст І.І.*Насовіч* змясціў у сваім «Зборніку беларускіх прыказак», 1867), «Тлумачальны слоўнік жывой вялікарускай мовы» (т. 1—4, 1863—66; больш за 200 тыс. слоў і 30 тыс. прыказак і прымавак; за яго атрымаў званне ганаровага акадэміка Пецярб. АН). У слоўніку шмат бел. нар. лексікі. Складаў слоўнікі бел. і ўкр. моў. Апрацоўваў казкі («Рускія казкі», 1832, «Быліцы і небыліцы», кн. 1—4, 1833—39), пісаў этнагр. нарысы («Падалянка», «Цыганка», «Балгарка», «Уральскі казак» і інш.), апавяданні і аповесці ў духу рус. *натуральнай школы* (пад псеўд. Казак Луганскі).

Тв.: Полн. собр. соч. Т. 1—10; СПб.; М., 1897—98; Толковый словарь живого великорусского языка. Т. 1—4. М., 1955; Пословицы русского народа. М., 1957; Повести. Рассказы. Очерки. Сказки. М.; Л., 1961.

Літ.: Канкава М.В. Даль как лексикограф. Тбилиси, 1958; Бессараб М.Я. Владимир Даль. 2 изд. М., 1972; Булатов М.А., Порудоминский В.И. Собирал человек слова... М., 1969; Порудоминский В.И. Даль. М., 1971; Яго ж. Повесть о «Толковом словаре». М., 1981.

І.У.Саламевіч.

У.І.**Даль**. Партрэт мастака В.Пярова. 1872.

Ю.К.К.**Даль**. Выбух Везувія. 1826.

ДАЛЬ (Dahl) Юхан Крысціян Клаўсен (24.2.1788, г. Берген, Нарвегія — 14.10.1857), нарвежскі жывапісец і графік; заснавальнік нарв. нац. пейзажа. Вучыўся ў Бергене (каля 1808) і ў АМ у Капенгагене (з 1811). З 1818 жыў у Дрэздэне (з 1824 праф. АМ). Зазнаў уплыў ням. рамантызму. Пісаў пераважна суровыя горы, бурлівыя рэкі, ціхія даліны і азёры Нарвегіі: «Від на Фортундаль» (1836), «Стальхейм. Пейзаж з вясёлкай» (1842) і інш.

ДА́ЛЬВА, мемарыяльны комплекс на ўшанаванне памяці жыхароў колішняй в. Дальва (Лагойскі р-н), якіх ням.-фаш. захопнікі сагналі ў хату аднаго з

Мемарыяльны комплекс **Дальва**.

жыхароў вёскі В.Кухаронка і спалілі. Створаны ў 1973 (скульпт. У.Церабун, Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1974). Размешчаны на адкрытай паляне сярод лесу. Каля дарогі камень-валун, на якім высечаны надпіс: «Да 19 чэрвеня 1944 г. тут была в. Дальва. За 10 дзён да вызвалення гітлераўцы жывымі спалілі яе жыхароў». Кампазіцыйным цэнтрам комплексу з'яўляецца пастаўлены на месцы спаленай хаты помнік: фігура маці і хлопчыка на фоне 3 сімвалічных абгарэлых бэлек. Каля помніка бетонная сцяна з пералікам 44 прозвішчаў тых, хто загінуў. Побач у памяць аб ахвярах пасаджаны 44 бярозкі.

ДА́ЛЬГАЎЗ (Dahlhaus) Карл (10.6.1928, г. Гановер, Германія — 1989), нямецкі музыказнавец. Праф. (1967). Прэзідэнт Т-ва муз. даследаванняў у Каселі (з 1977). Кіраваў выданнем поўнага збору твораў Р.Вагнера, супрацоўнік і кансультант 3-га (1967) і рэдактар 2 дадатковых (1972—73) тамоў муз. слоўніка Г.Рымана, аўтар-складальнік (з Г.Г.Эгебрэхтам) 2-томнага муз. слоўніка Бракгаўза-Рымана (1978—79), рэд. серыі «Новы даведнік музычнай навукі» (1980), аўтар кн. «Збор нарысаў па новай музыцы» (1978), «Музычны рэалізм» (1982), «Музычная тэорыя ў 18 і 19 ст.» (1984), «Што такое музыка?» (1985, з Эгебрэхтам).

ДА́ЛЬМАН (Dahlmann) Фрыдрых Крыстаф (13.5.1785, г. Вісмар, Германія — 5.12.1860), нямецкі гісторык і паліт. дзеяч. Д-р філасофіі (1910). Праф. Кільскага (1812—29), Гётынгенскага (1829—37), Іенскага (1838—42) і Бонскага (з 1842) ун-таў. Адзін з распрацоўшчыкаў канстытуцыі каралеўства Гановер 1833. У рэвалюцыю 1848—49 у Германіі дэп. *Франкфурцкага нацыянальнага сходу 1848—49*, адзін з лідэраў «малагерманцаў» — прыхільнікаў аб'яднання герм. зямель (без Аўстрыі) пад вяршэнствам Прусіі. Аўтар прац «Крыніцазнаўства нямецкай гісторыі» (1830), «Гісторыя Даніі» (т. 1—3, 1840—43), «Гісторыя Англійскай рэвалюцыі» (1844), «Гісторыя Французскай рэвалюцыі» (1845) і інш.

Дальмен у акрузе Дэмін (Германія) 23 ст. да н.э.

ДАЛЬМЕ́Н (франц. dolmen ад брэтонскага tol стол + men камень), старажытнае пахавальнае збудаванне, адзін з відаў мегалітычных збудаванняў. Складзены з вялізных каменных глыб і пліт да некалькіх дзесяткаў тон, пастаўленых вертыкальна і накрытых адной або некалькімі плітамі зверху. Найчасцей у Д. рэшткі некалькіх памерлых з каменнымі або бронзавымі прыладамі і ўпрыгожаннямі. Некат. Д. выкарыстоўваліся для пахаванняў на працягу дзесяткаў і нават соцень гадоў. Пашыраны ў прыморскіх абласцях Паўн. Афрыкі, Еўропы, у т.л. на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа і ў Крыме (бронзавы век), і Азіі (жалезны век).

ДАЛЬНАЗО́РКАСЦЬ, гіпермет-рапія, адхіленне ад нармальнай рэфракцыі вока, што перашкаджае выразна бачыць на блізкай адлегласці. Бывае рэфракцыйная (ад слабай пераламляльнай здольнасці аптычнай сістэмы вока) ці восевая (ад занадта кароткай пярэдне-задняй восі вока). Д. — звычайная рэфракцыя вока нованароджаных, пры росце паступова развіваецца суразмерная эметрапічная рэфракцыя вока. У дальназоркім воку прамяні святла, якія ідуць ад далёкіх і блізкіх прадметаў, перасякаюцца і збіраюцца за сятчаткай вока, таму прадметы відаць невыразна.

Адрозніваюць 3 ступені Д.: слабую, сярэднюю і высокую. Пры слабай і сярэдняй хворыя добра бачаць блізкія і далёкія прадметы, бо акамадацыйная здольнасць вока (магчымасць мяняць крывізну і таўшчыню крышталіка) добрая. На высокай ступені Д. хворыя кепска адрозніваюць прадметы здалёку і зблізку, нават з карэкцыяй. Некарэгіраваная Д. у дзяцей можа прывесці да развіцця *касавокасці*. Выпраўляюць Д. акулярамі з выпуклымі (збіральнымі) шкельцамі.

Л.М.Марчанка.

ДАЛЬНАМЕ́Р, прылада для вызначэння адлегласцей да аб'ектаў без непасрэдных вымярэнняў на мясцовасці. Паводле прынцыпу дзеяння адрозніваюць Д. геам. (пасіўнага) і фіз. (актыўнага) тыпаў. Выкарыстоўваюцца ў інж. геадэзіі, тапаграфіі, ваен. справе, навігацыі, астраноміі, фатаграфіі і інш.

Прынцып дзеяння Д. геам. тыпу засн. на рашэнні роўнабаковага трохвугольніка па вядомай старане (базе) і процілеглым (паралактычным) вугле. Такія прылады бываюць монакулярныя (з адным *акулярам*; напр., у *фотаграфічных апаратах*) і бінакулярныя (гл. *Стэрэаскапічны дальнамер*), з пастаяннай базай і пастаянным вуглом (гл. *Аптычны дальнамер*). Прынцып дзеяння Д. фіз. тыпу засн. на вымярэнні часавых або фазавых суадносін паміж пасланым і прынятым (адбітым ад аб'екта) сігналамі. У залежнасці ад выбранага дыяпазону і віду ваганняў адрозніваюць акустычныя Д. (гл. *Гідралакацыя*, *Рэхалот*), *радыёдальнамеры* і *святлодальнамеры*, у т.л. лазерныя.

П.С.Габец.

ДА́ЛЬНІ, руская назва кіт. горада *Далянь*. Выкарыстоўвалася да 1950, калі горад быў перададзены Кітаю.

ДА́ЛЬНЯЕ ЛЯ́ДА, дзве стаянкі каменнага веку каля в. Дальняе Ляда Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Даследаваны ў 1972, 1973 і 1988. На адной стаянцы знойдзены кароткія скрабкі, нуклеусы, пласціны, адшчэпы, расшчэплены крэмень. На другой выяўлены рабочыя месцы па апрацоўцы крэменю, прылады для апрацоўкі косці, скуры і дрэва, паляўнічыя прылады (наканечнікі стрэл, нажы). Былі сезоннымі стаянкамі-майстэрнямі пач. апрацоўкі крамянёвай сыравіны, адносіцца да *грэнскай культуры* ранняга мезаліту.

В.Ф.Капыцін.

ДА́ЛЬСКІ (сапр. Няелаў) Мамант Віктаравіч (1865, с. Кантэміраўка Палтаўскай вобл., Украіна — 21.6.1918), расійскі акцёр. З 1885 выступаў у т-рах Вільні, Растова, Новачаркаска, у 1890—1900 у Александрынскім т-ры (Пецярбург). З 1900 акцёр-гастралёр у правінцыяльных і сталічных т-рах. Яго мастацтва адметнае стыхійным тэмпераментам і адначасова натуральнасцю. Найб. блізкія яго дараванню былі героі моцных, неўтаймаваных страсцей і пачуццяў. Сярод лепшых роляў: Чацкі («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Нязнамаў («Без віны вінаватыя» А.Астроўскага), Рагожын («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Гамлет, Атэла (аднайм. п'есы У.Шэкспіра), Карл Моар («Разбойнікі» Ф.Шылера).

ДА́ЛЬТАН, Долтан (Dalton) Джон (6.9.1766, Іглсфілд, каля г. Уэркінгтан, Вялікабрытанія — 27.7.1844), англійскі хімік і фізік, стваральнік хім. атамістыкі. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1822). Адукацыю атрымаў самастойна. У 1781—93 выкладаў матэматыку ў школе ў Кендалі, з 1793 — фізіку і матэматыку ў Новым каледжы ў Манчэстэры. Адкрыў *кратных адносін закон* (1803), газавыя законы, названыя яго імем (гл. *Дальтана законы*). Прапанаваў і абгрунтаваў тэорыю атамнай будовы, ці хім. атамістыку, якая тлумачыла эмпірычны закон пастаянства саставу. Аўтар працы «Новая сістэма хімічнай філасофіі» (т. 1—2, 1808—27). Апісаў дэфект зроку, што атрымаў назву *дальтанізм*.

Літ.: Крицман В.А. Роберт Бойль, Джон Дальтон, Амедео Авогадро: Создатели атомно-молекулярного учения в химии. М., 1976.

ДА́ЛЬТАНА ЗАКО́НЫ, 1) адзін з асноўных газавых законаў, паводле якога ціск сумесі газаў, якія хімічна не ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, роўны суме *парцыяльных ціскаў*. Строга выконваецца для *ідэальных газаў*, набліжана — для рэальных газаў пры значэннях т-р і ціскаў, далёкіх ад крытычных. 2) Закон растваральнасці газаў у вадкасцях, паводле якога пры пастаяннай т-ры растваральнасць кожнага з кампанентаў газавай сумесі над вадкасцю прапарцыянальная яго парцыяльнаму ціску. Кожны газ раствараецца так, як быццам астатніх кампанентаў няма. Набліжана прыдатны для рэальных газаў пры ўмове невял. канцэнтрацыі газу ў растворы. Д.з. адкрыты Дж.*Дальтанам* у 1801 і 1803.

ДАЛЬТАНІ́ЗМ, прыроджанае расстройства каляровага зроку. Апісаны англ. фізікам Дж.*Дальтанам* у 1794. Бывае ў 8% мужчын і 0,5% жанчын; звязаны з адсутнасцю ці недастатковым функцыянаваннем аднаго з трох кампанентаў каляровага зроку. Распазнаюць Д. з дапамогай спец. (поліхраматычных) табліц і спектральных прылад (анамаласкопаў). Людзей з Д. не дапускаюць працаваць на транспарце, у авіяцыі і інш. (яны адрозніваюць у спектры толькі 2 колеры — жоўты і сіні).

ДА́ЛЬТАН-ПЛАН (Dalton-Plan), сістэма арганізацыі навуч.-выхаваўчай работы ў школе, засн. на прынцыпе індывідуальнага навучання. Узнікла ў пач. 20 ст. Аўтар Д.-п. — Е.Паркхерст. Упершыню выкарыстаны ў г. Долтан (штат Масачусетс, ЗША, адсюль назва). Пры арганізацыі работы паводле Д.-п. вучням давалася свабода ў выбары заняткаў і выкарыстанні свайго рабочага часу. Д.-п. дазваляў суаднесці тэмп навучання з магчымасцямі вучняў, прывучаў іх да самастойнасці, развіваў ініцыятыву, вымушаў шукаць рацыянальныя метады работы, выпрацоўваў пачуццё адказнасці за выкананне заданняў. У 1920-я г. ў сав. школе рабіліся спробы мадыфікацыі Д.-п. (форма брыгадна-лабараторнага метаду). Элементы Д.-п. захаваліся ў практыцы некаторых школ ЗША.

ДАЛЬЧЫ́НА (Dolcino; ? — 1.6.1307), кіраўнік антыфеад. і антыцарк. паўстання ў паўн.-зах. Італіі ў 1304—07. Манах. Вучань і паслядоўнік Г.*Сегарэлі*, развіваў ідэі секты *апастолікаў*. У 1304 на чале вял. атрада сваіх узбр. прыхільнікаў (пераважна сялян) з'явіўся ў перадгор'ях П'емонта і авалодаў далінай р. Сезія, дзе меркаваў стварыць вольную сял. абшчыну. Рост шэрагаў паўстанцаў і разгром імі некалькіх карных атрадаў прымусілі рым. папу Клімента V летам 1305 абвясціць супраць іх крыжовы паход. Паступова паўстанцы адцеснены ў горы і блакіраваны сіламі крыжаносцаў. У выніку ген. бітвы 23.3.1307 каля в. Ставела паўстанцы разгромлены, Д. трапіў у палон і быў спалены на кастры.

Літ.: Сушкевич Л.П. Восстание под руководством Дольчино // И живы памятью столетий: Очерки о вождях нар. движений в средневековой Европе. Мн., 1987.

ДАЛЭ́НГА-МАСТО́ВІЧ (Dołęga Mostowicz) Тадэвуш (сапр. Мастовіч; 10.8.1898, б. маёнтак Акунёва, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. — 16 ці 20.9.1939), польскі пісьменнік і журналіст. Дзіцячыя гады правёў у Глыбокім. Вучыўся ў Кіеўскім ун-це. У 1922—26 супрацоўнік і рэд. варшаўскай газ. «Rzeczpospolita» («Рэспубліка»). Удзельнік польска-герм. вайны 1939, у час якой і загінуў. Аўтар 16 аповесцей, займальнасць і меладраматызм сюжэтаў якіх прынеслі Д.-М. вял. папулярнасць. Найб. значныя — «Кар'ера Нікадзіма Дызмы» (1932), у якой стварыў сатыр. карціну тагачаснага вышэйшага польск. грамадства. Сярод інш.: «Пракурор Аліцыя Горн» (1933), «Трэці пол» (1934), «Доктар Мурэк звольнены» і «Другое жыццё» (1936), «Знахар» (1937), «Прафесар Вільчур» (1939). Падзеі некат. твораў разгортваюцца на тэр. Зах. Беларусі («Кар'ера Нікадзіма Дызмы», «Знахар» і інш.). Большасць твораў Д.-М. экранізаваны.

Тв.: Рус. пер. — Знахарь. Мн., 1993; Профессор Вильчур. Мн., 1994.

Літ.: Ермалёнак В.А. Тадэвуш Далэнга-Мастовіч // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Глыбоцкага р-на. Мн., 1995. С. 167—168.

Ю.В.Бажэнаў.

М.А.**Даляжаль**.

Г.**Дам**.

ДАЛЯЖА́ЛЬ Мікалай Антонавіч (27.10.1899, с. Амельнік Запарожскай вобл., Украіна), расійскі вучоны-энергетык. Акад. АН СССР (1962, чл.-кар. 1953). Двойчы Герой Сац. Працы (1949, 1984). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1923). З 1935 гал. інжынер з-даў «Бальшавік» (Кіеў), «Уралхіммаш», з 1942 дырэктар НДІ хім. машынабудавання (Масква), з 1953 гал. канструктар-дырэктар Ін-та энергатэхнікі, саветнік. Гал. канструктар рэактара першай у свеце атамнай электрастанцыі (г. Обнінск, Расія). Навук. працы па інж. і навук. праблемах цеплаэнергетыкі, выкарыстання ядз. энергіі ў энергетыцы. Ленінская прэмія 1957. Дзярж. прэмія СССР 1949, 1952, 1953, 1970, 1976.

Тв.: Основы проектирования паросиловых установок. М.; Л., 1933; Канальный ядерный энергетический реактор. М., 1980 (разам з І.Я.Емяльянавым); У истоков рукотворного мира: Зап. конструктора. М., 1989.

ДАЛЯ́НЬ, рус. Дальні, горад на ПнУ Кітая, у прав. Ляанін. Уваходзіць у адм. раён Люйда. 1,7 млн. ж. (1990). Буйны порт у зал. Даляньвань Жоўтага м., на паўд. канцы п-ва Гуаньдун. Знешнегандл. і прамысл. цэнтр. Прам-сць: металургічная, маш.-буд. (у т.л. судны), хім., нафтаперапр., электронная, буд. матэрыялаў, тэкст., харчовая. Рыбалавецкая база.

Першапачаткова рыбацкі пасёлак Цыніва. З 1860 наз. Д. Расія, атрымаўшы ў часовую арэнду ч. тэр. Кітая, у 1899 пабудавала на месцы пасёлка канцавую станцыю Усх.-Сіб. чыгункі і пераназвала яго Дальні. У 1904—45 акупіраваны Японіяй. У жн. 1945 вызвалены Сав. Арміяй. Паводле сав.-кіт. дагавора 1945 кіт. ўрад прызнаў Д. свабодным портам. Прыстані і складскія памяшканні порта былі перададзены на 30 гадоў у арэнду СССР. У 1950 уся маёмасць бязвыплатна перададзена Кітаю.

ДАЛЯНЬВА́НЬ, заліў Жоўтага м., каля ўсх. ўзбярэжжа п-ва Гуаньдун. Даўж. 11 км, шыр. каля ўвахода 11 км, глыб. да 20 м. Прылівы паўсутачныя (да 3 м). Порт — Далянь (Дальні).

ДАМ (Dam) Генрык Карл Петэр (21.2.1895, Капенгаген — 17.4.1976), дацкі біяхімік. Чл. Каралеўскай АН Данії. Д-р філасофіі (1934), праф. біяхіміі (1941). Скончыў Капенгагенскі політэхн. ін-т (1920). З 1923 у Капенгагенскім ун-це. З 1940 выкладаў у ЗША і Канадзе, з 1942 працаваў у Рачэстэрскім ун-це, з 1946 у Капенгагенскім політэхн. ін-це, у 1956—62 у Дацкім савеце па даследаванні тлушчаў. Навук. працы па біяхіміі стэрынаў і вітамінаў. Вынайшаў вітамін K_1 (філахінон). Вызначыў, што адсутнасць вітаміну Е у рацыёне жывёл выклікае мышачную дыстрафію. Нобелеўская прэмія 1943 (разам з Э.А.*Дойзі*).

ДАМАВІ́К, вобраз у старадаўніх павер'ях беларусаў і інш. народаў. На Беларусі яго ўяўлялі ў выглядзе старога чалавека ў белай вопратцы, з сівой барадой і доўгімі валасамі, які жыў у хаце (пад ці за печчу) або ў сенцах, каморы, клеці. Паводле павер'яў у кожнай хаце (сям'і) быў свой Д. (увасабляў памерлага гаспадара), які нібыта ахоўваў дом, клапаціўся пра гаспадарку, назіраў за сямейным побытам і інш. Прымхлівыя людзі імкнуліся задобрыць Д.: у памінальныя і святочныя дні яго клікалі да стала, «частавалі» лепшымі стравамі, прасілі, каб не рабіў шкоды. Рэліг. значэнне вобраз Д. страціў у канцы 19 — пач. 20 ст. Знайшоў адлюстраванне ў бел. фальклоры (пераважна ў былічках).

М.Ф.Піліпенка.

ДАМАВЫ́ ВЕРАБЕ́Й, гл. ў арт. *Вераб'і*.

ДАМАВЫ́ СЫЧ, гл. ў арт. *Сычы*.

ДАМАВЫ́Я ГРЫБЫ́, група базідыяльных дрэваразбуральных грыбоў, якія выклікаюць гнілі драўніны ў будынках. Пашыраны па ўсім зямным шары. Каля 70 відаў; на Беларусі каля 20. Найб. шкодныя Д.г.: сапраўдны, белы, плеўкавы, пласціністы, шпалавы, плотавы, дубовая губка, а таксама віды з роду фібрапорыя, глеяфіл, фамітопсіс і інш. Пры спрыяльных умовах яны здольны за 1—2 гады цалкам разбурыць пашкоджаныя канструкцыі будынкаў і выклікаць бурую дэструктыўную гніль. Больш устойлівая да пашкоджання Д.г. драўніна дубу, каштану, белай акацыі, чырвонага дрэва.

Міцэлій Д.г. разгалінаваны, утварае на паверхні драўніны павуціністыя або камякападобныя плеўкі, шнуры і ватападобныя або лямцавыя ўтварэнні. Пладовыя целы развіваюцца рэдка. Заражэнне драўніны адбываецца базідыяспорамі (жыццяздольныя некалькі гадоў), міцэліем, рэштkамі пашкоджанай драўніны. Унутры будынкаў Д.г. хутка распаўсю-

джваюцца пры дапамозе міцэліяльных шнуроў. Развіццю Д.г. спрыяе вільготнасць і застаялае паветра. Меры барацьбы: прафілактычныя і антысептычная апрацоўка.

Літ.: Головко А.И. Домовые грибы и меры борьбы с ними. Мн., 1981.

ДАМАДА́РСКІ ВУ́ГАЛЬНЫ БАСЕ́ЙН, найбуйнейшы ў Індыі. Размешчаны ў даліне р. Дамодар (штаты Зах. Бенгалія, Біхар). Пл. каля 4500 км². Вугляносныя адклады пярмі. Агульныя запасы да глыб. 600 м — 54 млрд. т, з іх 5,3 млрд. т каксавальныя вугалі. Прамысл. распрацоўка з 1830. Цеплыня згарання 26,8—33,2 МДж/кг. Здабыча падземным спосабам і на кар'ерах. Вугаль выкарыстоўваецца на металург. прадпрыемствах, для вытв-сці электраэнергіі, у цэментнай прам-сці. Асн. цэнтры здабычы: гарады Джхарыя, Бакара, Ранігандж.

ДАМАДЗЕ́ДАВА, горад у Расіі, цэнтр раёна ў Маскоўскай вобл. 56,5 тыс. ж. (1992). Засн. ў 1900. Чыг. станцыя. Вытв-сць буд. матэрыялаў (метал. канструкцыі, жалезабетонныя вырабы, цэгла і інш.); машынабуд., лёгкая, харч. прам-сць. Каля Д. адзін з асн. аэрапортаў Масквы — Дамадзедава.

ДАМА́М, горад у Саудаўскай Аравіі. Адм. ц. Усх. правінцыі. Каля 0,8 млн. ж. з прыгарадамі (1994). Порт у Персідскім зал. Канцавы пункт чыгункі з Эр-Рыяда. Прам-сць: хім., сталеплавільная, шкляная, папяровая, цэментная. Рыбалоўства. Ун-т. Д. — арганізацыйны цэнтр здабычы нафты і газу на У краіны.

ДАМА́МЕРЫЧЫ, вёска ў Клімавіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Сасноўка, на аўтадарозе Крычаў—Рослаўль (Расія). Цэнтр сельсавета. За 14 км на Пн ад горада і 12 км ад чыг. ст. Клімавічы, 110 км ад Магілёва. 151 ж., 88 двароў (1997). Б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ДАМА́НАВА, вёска ў Івацэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе р. Грыўда; чыг. ст. на лініі Брэст—Баранавічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 19 км на ПнУ ад Івацэвіч, 155 км ад Брэста. 1400 ж., 541 двор (1997). Вытв.-гандл. камбінат. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. За 3 км ад Д. магіла ахвяр фашызму.

ДАМА́НАВА Вольга Мікалаеўна (н. 24.12.1958, г. Магілёў), бел. жывапісец. Скончыла Мінскае маст. вучылішча (1978). У ранняй творчасці сімволіка-алегарычнае асэнсаванне рэчаіснасці (серыя з 9 работ «Успамін пра Русь», 1989—90). У творах «Збіральнікі галля» (1994), «Збіральнікі камення» (1995), «Малітва» (1997) і інш. асацыятыўна-філас. трактоўка вобразаў, увасобленая праз нюансавы колеравы лад. Працуе таксама ў плакаце («Не парушаць экалагічную раўнавагу!», «У што веру?»).

А.І.Атраховіч.

ДАМА́НАВА Святлана Уладзіміраўна (н. 18.9.1963, Мінск), бел. жывапісец. Скончыла Мінскае маст. вучылішча (1982), Бел. АМ (1991). Разнастайная па тэматыцы творчасць пабудавана на кантрастах: работы ў алеі яркія, дынамічныя (трыпціх «Музыканты», «Сасуд», абедзве 1995), у тэмперы — больш мяккія, у блакітна-бірузовым, ружова-пастэльным каларыце (трыпціх «Стыхіі», 1994, «Эўрыдыкі» 1997). Свет створаных ёй вобразаў непаўторны, сімвалічны і сведчыць пра пошук уласнай адметнай стылістыкі.

ДАМА́НАВІЦКІ КАНА́Л, меліярацыйны канал у Салігорскім р-не Мінскай і Жыткавіцкім р-не Гомельскай абласцей. Левы прыток р. Случ (бас. р. Прыпяць). Даўж. 30 км. Пачынаецца з Асавецкага канала за 2 км на Пн ад в. Абідземля Салігорскага р-на, вусце за 4,5 км на Пн ад в. Новыя Мілевічы Жыткавіцкага р-на.

С.Даманава. «Сасуд». 1995.

ДАМА́НАВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1935—60. Утвораны 12.2.1935, з 21.6.1935 у *Мазырскай акрузе*. Цэнтр — гар. пас. *Азарычы*. Падзяляўся на 18 сельсаветаў. З 20.2.1938 у Палескай, з 8.1.1954 у Гомельскай абл. Скасаваны 20.1.1960, тэр. перададзена ў Акцябрскі, Калінкавіцкі, Капаткевіцкі і Парыцкі р-ны.

ДАМА́НАВІЧ (Домановић) Радоэ (4.2.1873, Оўсіштэ, каля г. Крагуевац, Сербія — 4.8.1908), сербскі пісьменнік. Скончыў Белградскі ун-т (1894). За выступленне супраць абсалютызму дынастыі Абрэнавічаў зазнаў ганенні. Раннім аповесцям і апавяданням Д. ўласціва ўвага да побыту жыцця тагачасных горада і вёскі («Дзень нараджэння», «Сны і ява», «На раздарожжы» і інш.). З канца 1890-х г. — пачынальнік сербскай сатыры, стваральнік жанру алегарычна-сатыр. прозы: апавяданні «Не разумею!» (1898), «Кляймо» (1899), «Каралевіч Марка другі раз між сербаў» (1901), аповесць «Страдыя» (1902) і інш. Творы Д. на бел. мову перакладаў І.Чарота.

Тв.: Бел. пер. — Сны і ява. Сербская ініцыятыва. Бессардэчныя людзі // Далягляды. Мн., 1979; Рус. пер. — Повести и рассказы. М., 1956.

І.А.Чарота.

ДАМА́НАВІЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., каля аўтадарогі Мінск—Мазыр. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 31 км на Пн ад Калінкавіч, 151 км ад Гомеля, 7 км ад чыг. ст. Халоднікі. 808 ж., 301 двор (1997).

Узнікла не пазней пач. 16 ст. У інвентары Мазырскага замка 1552 упамінаецца як сяло, цэнтр «нядзелі» (адм.-тэр. адзінкі ў складзе воласці), 35 двароў. З 1565 у *Мазырскім павеце*, дзярж. ўласнасць. У 17—18 ст. цэнтр староства. З 1793 у Рас. імперыі, у Рэчыцкім пав. Да 1861 ва ўладанні памешчыка Міхайлава і яго нашчадкаў. Мелася праваслаўная царква. З 1861 цэнтр воласці Рэчыцкага пав. У 1924 —35 і з 1960 у Калінкавіцкім р-не, у 1935—60 у *Даманавіцкім раёне*. У 1971 — 779 жыхароў.

Агароднінасушыльны з-д. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

В.Л.Насевіч.

ДАМА́НАВІЧЫ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 51 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Салігорск, 180 км ад Мінска, 369 ж., 142 двары (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму.

ДАМА́НАЎ Аляксандр Уладзіміравіч (н. 17.10.1959, Мінск), бел. жывапісец. Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1978). У жывапісных творах распрацоўвае сюррэалістычны кірунак вобразнавыяўл. трактоўкі: «Рэквіем» (1993), «Імгненне вечнасці», «Натура, якая сыходзіць» (абедзве 1995) і інш. Сярод работ у плакаце: серыі экалагічная (1988) і палітычная (1989), «Быццё» (1990). Працуе таксама ў тэхніцы графічнага дызайну.

А.І.Атраховіч.

ДАМА́НАЎСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, у Івацэвіцкім р-не Гомельскай вобл., за 16 км на ПнУ ад г. Івацэвічы, каля в. Даманава. Створана ў 1954. Пл. 1,82 км², даўж. 2 км, найб. шыр. 1,5 км,

найб. глыб. 3,5 м, аб'ём вады 1,82 млн. м^3. Чаша вадасховішча — ч. поймаў Шчары і Грыўды, агароджана дамбай даўж. 6,75 км. Напаўняецца вадой р. Шчара, якая паступае праз шлюзы з Чамялынскага вадасх., размешчанага вышэй па цячэнні. Выкарыстоўваецца для энергет. мэт і рыбагадоўлі.

ДАМА́НАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, гл. *Дыманоўскае возера.*

ДАМАНЕ́ЎСКІ Дзмітрый Сяргеевіч (н. 6.7.1940, Мінск), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1985), праф. (1986). Скончыў БДУ (1962). З 1978 у БПА (з 1988 прарэктар), у 1993—95 у Мін-ве адукацыі і навукі Беларусі, з 1995 у БПА. Навук. працы па фізіцы і тэхніцы паўправаднікоў, мікраэлектроніцы, прыладабудаванні. Распрацаваў колькасныя і якасныя метады люмінесцэнтнага аналізу паўправаднікоў, апаратуру для тэхнал. кантролю якасці паўправадніковых матэрыялаў і прылад.

Тв.: Физика и материаловедение полупроводников с глубокими уровнями. М., 1987 (у сааўт.).

ДАМАНЕ́ЎСКІ (Даманоўскі) Фабіян, бел. мысліцель-гуманіст і паэт эпохі Адраджэння і барока. Ідэолаг нонадарантызму (рэліг.-філас. рух у Беларусі 2-й пал. 16 ст.). Крытыкаваў Біблію, лічыў Хрыста не Богам, а простым чалавекам, адмаўляў неўміручасць душы, існаванне замагільнага свету. У 1589 разам з С.Будным у палеміцы з езуітамі даказваў, што душа чалавека пасля смерці гіне разам з целам. Аўтар верша на польскай мове «Эпіграма на герб Лясот», надрукаванага ў кнізе С.Буднага «Пра свецкую ўладу» (1583). У творы выказаў думку, што ўсякая ўлада павінна быць разумнай, кіравацца маральнымі дабрачыннасцямі.

Літ.: Подокшин С.А. Скорина и Будный: Очерк филос. взглядов. Мн., 1974.
С.А.Падокшын.

ДАМАНЕ́ЎСКІ (Даманоўскі) Язэп (2-я пал. 16 ст. — 1-я пал. 17 ст.), бел. мысліцель і гуманіст, паэт эпохі позняга Адраджэння і барока. Сын Ф.*Даманеўскага*. З пазіцый сацыніянства (гл. *Сацыніяне*) удзельнічаў у 1594 у Навагрудку ў дыспуце з філосафам-схаластам М.Сміглецкім пра спрадвечнасць Хрыста. У канцы 1590-х г. схіляўся да атэізму, адмаўляў бессмяротнасць душы, існаванне замагільнага свету, за што быў выключаны з сацыніянскай абшчыны. Займаўся паэт. творчасцю, пісаў на польск. і лац. мовах. Свае філас.-этычныя погляды адлюстраваў у вершаваных творах «Жыццё сельскае і гарадское», «Перасцярога і заахвочванне тым, хто многа гаворыць і думае, але нічога не робіць», «Суцяшэнне тым, каму мужы перашкаджаюць паводзіць сябе з годнасцю», «Некаторыя эмблемы», «Афарызмы Саламона ў паэтычным выкладанні» і інш. (1620—23). Апяваў працавітасць, памяркоўнасць, сумленнасць, імкненне да ведаў, чалавечы розум. Ідэалізаваў вясковае жыццё як увасабленне «натуральнага стану» чалавека. Каларытна апісаў жыццё бел. горада пач. 17 ст.

Літ.: Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990. *С.А.Падокшын.*

ДАМА́НЫ (Nytacoidea), атрад млекакормячых. 1 сям., 3 роды: Д. дрэвавыя (Dendrohyrax), Д. горныя, або шэрыя (Heterohyrax), Д. скалістыя, або пустынныя (Procavia). 7 відаў. Пашыраны ў Афрыцы і Паўд.-Зах. Азіі (п-вы Аравійскі, Сінайскі, Сірыя і Палесціна). Жывуць у лясах (Д. дрэвавыя) і ў гарах. Наземныя Д. селяцца калоніямі.

ДАМА́РА, нагор'е ў Намібіі; гл. *Дамараленд.*

ДАМАРА́Д Канстанцін Ільіч (7.11.1918, в. Языль Старадарожскага р-на Мінскай вобл.), бел. гісторык. Канд. гіст. н. (1955). Скончыў БДУ (1949). У Вял. Айч. вайну ў 1941—43 у органах ваен. разведкі і контрразведкі Зах. фронту. З жн. 1943 у тыле ворага, ў складзе аператыўнай групы ЦК КП(б)Б, кіраўнік спецгрупы НКДБ БССР «Жнівень», адначасова нам. камандзіра Барысаў-

Даўж. цела 30—60 см, маса 1,5—4,7 кг. Вонкавым выглядам нагадваюць грызуноў, але філагенетычна бліжэй да хобатных. Афарбоўка карычнева-шэрая. Хвост даўж. 1—3 см або адсутнічае. Верхняя губа раздвоеная. Пярэднія лапы чатырохпальцавыя, заднія трохпальцавыя з капытападобнымі кіпцюрамі, на падэшве моцны прысосак. Пераважна расліннаедныя. Нараджаюць 1—6 дзіцянят.

В.**Даманава**. Работа з серыі «Успаміны пра Русь». 1989—90.

А.**Даманаў**. Натура, якая сыходзіць. 1995.

Даман капскі.

ска-Бягомльскага партыз. злучэння. У 1944—46 нам. старшыні Мінскага аблвыканкома. У 1956—75 працаваў у БПІ, Мінскім радыётэхн. ін-це, у 1975—92 у ін-тах гісторыі партыі пры ЦК КПБ, гісторыі АН Беларусі. Даследуе гісторыю Вял. Айч. вайны, Мінскае гарадское антыфаш. падполле 1941—42. Адзін з аўтараў працы «Усенародная барацьба на Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны» (т. 1—3, 1983—85), «Нарысаў ваеннай гісторыі Беларусі» (ч. 4—5, 1995).

Тв.: Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР. Мн., 1959 (з Г.А.Барадачом); Партийное подполье и партизанское движение в Минской области, 1941—1944. Мн., 1992; Разведка и контрразведка в партизанском движении Белоруссии, 1941—1944 гг. Мн., 1995; Так ли должны писаться военные мемуары? // Воен.-ист. журн. М., 1966, № 11.

ДАМА́РАЛЕНД (Damaraland), Дамара, нагор'е ў цэнтр. ч. Намібіі ў Афрыцы. Ступенямі ўзвышаецца над берагавой пустыняй Наміб. Пераважаюць выш. 1000—1500 м, найб. — 2600 м (г. Брандберг). Клімат трапічны, сухі. Ападкаў 250—500 мм за год. Расліннасць на З злакава-хмызняковых пустынь з сукулентамі, на У апустыненая саванна.

ДАМАРА́ЦКІ Уладзімір Аляксандравіч (н. 2.9.1946, г. Гомель), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю па класах фп. (1971) і кампазіцыі (1979, клас Дз.*Смольскага*). У 1979—82 дырыжор Сімфанічнага аркестра Бел. тэлебачання і радыё. З 1984 выкладчык Мінскай дзіцячай муз. школы № 9. Найб. значныя творчыя дасягненні ў сімф. і канцэртным жанрах. Яго музыцы ўласцівы тэмбравая маляўнічасць, нестандартнасць драматург. вырашэнняў. Сярод твораў: кантаты «Мая Беларусь» на словы Я.Коласа (1982) і «Каб ведалі» на словы М.Танка (1984); сімфоніі (1981, 1990); канцэрты — для трубы (1980, 1992), для валторны з арк. (1985), для аркестра (1987), «Палескія песні» для аркестра бел. нар. інструментаў (1988), канцэрціна для кларнета і фп. (1989); санаты для кларнета (1984) і «Мазаіка» для фп. (1986), «Партыта» для брасквінтэта (1988); інстр. п'есы; музыка да драм. спектакляў. Дзярж. прэмія Беларусі 1996. *Р.М.Аладава.*

ДАМА́СК, араб. Дымашк, Дымішк, горад, сталіца Сірыі. Адм. ц. мухафазы Дамаск. Знаходзіцца ў даліне р. Барада, ва ўсх. перадгор'ях Антыліванa. 1444 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Галоўны гандл.-прамысл., фін. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: харч. (асабліва цукр., мукамольная, піваварная, тытунёвая, шакаладная, вытв-сць цукатаў), цэм., шкляная, тэкст., фармацэўтычная, радыёэлектронная, металічная. Рамесніцкая вытв-сць (залатыя, сярэбраныя, медныя, латунныя, скураныя, драўляныя вырабы, дываны, парчовыя тканіны). Цэнтр турызму. Ун-т. Дамаская і Арабская акадэміі. Музеі, тэатры.

Упершыню ўпамінаецца ў 16 ст. да н.э., калі знаходзіўся пад уладай егіп. фараонаў. З канца 11 да 732 да н.э. цэнтр *Дамаскага царства*, пазней у складзе *Ахеменідаў дзяржавы*, з 4 ст. н.э. пад уладай Візантыі. У 635 завяваны арабамі. Росквіту дасягнуў, калі стаў сталіцай *Амеядаў халіфата* (661—750). З канца 11 ст. цэнтр супраціўлення крыжаносцам (у 1148 беспаспяховая аблога горада Конрадам III). У 13 — пач. 16 ст. цэнтр караваннага гандлю і рамесніцтва. У 1260 захоплены *мамлюкамі*, у 1401 — *Цімурам*, у 1516 — туркамі на чале з Селімам I. Фанатыкі-мусульмане ў 1840 выразалі яўр., у 1860 — хрысц. насельніцтва горада. Да канца 1-й сусв. вайны ў складзе Асманскай імперыі. У 1920—43 адм. ц. франц. падмандатнай тэрыторыі. З 1943 сталіца Сірыі.

Рэгулярная планіроўка асобных кварталаў бярэ пачатак ад эліністычнага і рым. перыядаў. Сярод помнікаў рым. часу: рэшткі абарончых сцен, акведук (функцыянуе), карынфская каланада ўвахода ў свяцілішча

Да арт. **«Дамастрой»**. Аркуш з застаўкай. Фрагмент.

Юпітэра Дамаскага (1 ст. н.э., на месцы арамейскага храма Хадада, у візант. час перабудаваны ў царкву Іаана Хрысціцеля). Помнікі сярэдневяковай араб. архітэктуры: *Амеядаў мячэць*, марыстан Нур-ад-дзіна (1154, засн. як шпіталь і мед. школа), маўзалей Салах-ад-дзіна (12 ст., рэстаўрыраваны ў 19 ст.), медрэсэ ан-Нурыя (1172), Адылія (1171—1222, цяпер Араб. акадэмія) і Захірыя (1277, цяпер Нац. б-ка), мячэці асманскага часу Такія Сулейманія (1554, арх. Сінан), Дэрвішыя (1574), Сінан-пашы (1586—91), шматлікія караван-сараі (ханы) 15—18 ст., палац Азема (1749, цяпер Музей нар. мастацтва). Забудоўваецца па генпланах 1929 і 1967. Старадаўні цэнтр маст. рамёстваў. Стары Д. уключаны ЮНЕСКА ў *спіс Сусветнай спадчыны.*

ДАМА́СКАЕ ЦА́РСТВА, старажытная дзяржава ў Сірыі ў 11—8 ст. да н.э. Вядома з асіра-вавілонскіх і егіп. крыніц і Біблії. Засн. *арамеямі*. У пач. 10 ст. падпарадкавана Ізраільскаму царству, з сярэдзіны стагоддзя самастойнае. З канца 10 ст. прэтэндавала на гегемонію ў Сірыі. Найб. магутнасці дасягнула ў пач. 8 ст. да н.э. У 732 да н.э. заваявана Асірыяй.

ДАМА́СКАЯ СТАЛЬ, 1) тое, што *булат*. 2) Пругкая і цвёрдая ўзорыстая сталь, якую атрымліваюць кавальскай зваркай сплеценых стальных (з рознай колькасцю вугляроду) палос, або дроту. Назва — ад г. Дамаск, дзе вытв-сць сталі была развіта ў сярэдневякоўі, часткова і ў новы час.

ДАМА́СКІ ХАЛІФА́Т, гл. ў арт. *Амеядаў халіфат*.

«ДАМАСТРО́Й», помнік стараж.-рус. л-ры 16 ст., збор жыццёвых правіл і павучанняў. Узнік у асяроддзі наўгародскага баярства. У сярэдзіне 16 ст. яго апрацаваў святар Сільвестр, прыбліжаны цара Івана Грознага. «Д.» — своеасаблівы маральна-этычны кодэкс, які адлюстроўваў прынцыпы тагачаснага патрыярхальнага побыту, сцвярджаў поўнае падначаленне ўладзе гаспадара ў сям'і і інш.

ДАМАТКА́НАВІЧЫ, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на ПнЗ ад Клецка, 137 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Клецк. 920 ж., 316 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнікі архітэктуры — ветраны млын (пач. 20 ст.) і сядзіба (19—20 ст.).

ДАМА́ЧАВА, гарадскі пасёлак у Брэсцкім р-не. За 52 км ад г. Брэст, 3 км ад чыг. ст. Дамачава. 1,2 тыс. ж. (1997).

У 19 ст. мястэчка, цэнтр воласці Брэсцкага пав. У 1897 — 1163 ж. У 1921—39 у Польшчы. З 1939 у БССР, з 1940 гар. пасёлак, цэнтр *Дамачаўскага раёна*. З 22.6.1941 да 23.7.1944 акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія загубілі ў Д. і раёне каля 20 тыс. чал. У канцы 1941 фашысты стварылі ў Д. гета і знішчылі больш за 2700 яго вязняў. 23.9.1943 гітлераўцы расстралялі каля в. Ляплёўка 54 дзіцяці дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту Дамачаўскага дзіцячага дома разам з іх выхавацельніцай. У ходзе *Дамачаўскіх баёў 1943* партызаны разгромілі ў Д. варожы гарнізон. У 1956 Д. ў Брэсцкім р-не.

Прадпрыемствы харч. і мясц. прам-сці. Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, паліклініка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — царква Святога Лукі (пач. 20 ст.).

ДАМА́ЧАЎСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1940—56. Утвораны 15.1.1940 у Брэсцкай вобл. Цэнтр — г.п. *Дамачава*. Пл. 0,5 тыс. га. 12.10.1940 падзелены на 7 сельсаветаў. Скасаваны 17.12.1956, тэр. перададзена ў *Брэсцкі раён*.

ДАМА́ЧАЎСКІ СТРОЙ, традыцыйны комплекс бел. нар. адзення ў Зах. Палессі. Быў пашыраны ў ваколіцах г.п. Дамачава, паўд.-зах. частцы Брэсцкага і Маларыцкага р-наў (уздоўж р. Буг), на

тэр. Полышчы (ваколіцы г. Уладава) і ў паўн.-зах. раёнах Валынскай вобл. Украіны.

Жаночы касцюм складаўся з кашулі, спадніцы-рабака, фартуха, гарсэта, галаўнога ўбору. Кашуля мела шырокі адкладны каўнер, вышыты па краях. Аздаблялася малінавым з украпаннямі чорнага арнаментам гладкіх і пункцірных палос на плечавой устаўцы, верхняй і ніжняй частцы рукава. Ніжні ўзорысты шляк рукава дамінаваў над верхнімі палосамі арнаментам зорак, крыжыкаў, зігзагаў і інш. Спадніца і фартух (1-полкавы) шыліся з аднолькавай па якасці і каларыстычна-арнаментальным вырашэнні даматканай паўшарсцяной ці льняной тканіны, прасаваліся ў буйныя складкі. Усё поле спадніцы запаўнялі чырвоныя, зялёныя, белыя, блакітныя, чорныя падоўжныя ці папярочныя палосы. Неад'емнай часткай касцюма дзяцей, дзяўчат і падлеткаў быў гарсэт (гарсэт-безрукаўка і гарсэт з рукавамі — кабат). Жаночыя гарсэты шылі з блакітнай тонкай шэрсці фабрычнага вырабу, спераду багата аздабляліся рознакаляровымі тасёмкамі, стужкамі, гузікамі, дэкар. строчкай. Прасцей былі гарсэты з валенага (лямцаванага) даматканага сукна цёмна-карычневага колеру. Галаўным уборам замужніх жанчын быў чырвоны каптур (з бакавымі вушкамі і зубцом над ілбом), бачны край якога аздабляўся карункамі, залацістай тасьмой. Паверх каптура накладалі згорнутую ў валік накрухмаленую пярэстую крамную хустку. Мужчыны насілі белую кашулю з стаяча-адкладным каўняром, падперазаную вузкім тканым поясам, карычнева-шэрыя нагавіцы і гарсэт з рукавамі ці без рукавоў (аздабляўся вітым і плеценым коскай рознакаляровым шнурам і тасьмой). На галаву надзявалі саламяныя капелюшы з чорнай стужкай.

М.Ф.Раманюк.

ДАМА́ЧАЎСКІЯ БАІ 1943. Адбыліся паміж партызанамі атрадаў імя Варашылава, імя Жукава, брыгады імя Сталіна Брэсцкай вобл. і ням.-фаш. захопнікамі на чыг. ст. і ў г.п. Дамачава Брэсцкага р-на ў Вял. Айч. вайну. У ноч на 23 кастр. партызаны на таварнай станцыі ўзарвалі ўмацаванні гітлераўцаў, разбурылі станцыйнае абсталяванне, спалілі падрыхтаваны для адпраўкі ў Германію эшалон са збожжам і бульбай. 22 ліст. для разгрому варожага гарнізона партызаны перакрылі шашу Брэст—Уладава і дарогі ў суседнія вёскі, агнём паралізавалі праціўніка ў будынку школы і палцэйскім участку Дамачава, знішчылі памяшканні, захапілі зброю, абмундзіраванне, 200 галоў буйн. раг. жывёлы і харчаванне, нарабаваныя ў насельніцтва.

ДАМА́ШКАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Докшыцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бярэзіна, за 35 км на ПдУ ад г. Докшыцы. Пл. 0,67 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 700 м, даўж. берагавой лініі каля 4,1 км. Пл. вадазбору 11,9 км^2. Схілы катлавіны выш. 20—25 м (на ПнЗ 5—8 м), параслі лесам, на Пн разараныя. Берагі зліваюцца са схіламі.

ДАМА́ШНІКАЎ Барыс Фёдаравіч (н. 5.4.1924, в. Крыгавузава Іванаўскай вобл., Расія), башкірскі жывапісец-пейзажыст. Нар. мастак СССР (1982). Скончыў тэатральна-маст. вучылішча ва Уфе (1950). Аўтар лірычных пейзажаў «Зіма на ўскраіне» (1955), «Па Паўднёвым Урале» (1955—57), «Самарканд» (1960), «Вясна. Затапіла» (1963), «Вячэрні сеанс» (1969), «Урал» (1970—74), «Старая Уфа» (1979—83) і інш., адметных свежасцю і вострым адчуваннем успрымання прыроды, мажорнасцю каляровай гамы. Рэсп. прэмія імя Салавата Юлаева 1977.

ДАМА́ШНЯЯ АДУКА́ЦЫЯ, форма агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі ва ўмовах сям'і. У старажытнасці і сярэдневякоўі (да станаўлення сістэм адукацыі) забяспечвала саслоўна-прафес. пераемнасць. Элементарным тыпам Д.а. можна лічыць перадачу ад бацькоў дзецям ведаў, прафес. вопыту, асноў светапогляду, у т.л. рэліг. выхаванне. У зах. краінах з сярэдзіны 1970-х г. Д.а. набыла новыя рысы ў межах пед. руху «flexischooling» (гібкая адукацыя), паводле якога акрамя школы месцам адукацыі можа быць дом, музей, б-ка і інш.; бацькі разглядаюцца як актыўныя партнёры школы; не абавязковай лічыцца прысутнасць настаўніка ў навуч. працэсе; вучоба скіравана на выяўленне і развіццё здольнасцей вучня; магчымасці дома (выкарыстанне сучасных тэхн. сродкаў навучання) разглядаюцца як кампанент школьнай праграмы. «Flexischooling» спалучае Д.а. з навучаннем у школе. У Рас. імперыі ў 18—19 ст. Д.а. мела важнае значэнне для фарміравання сістэмы агульнай адукацыі. З узнікненнем ун-таў, гімназій і інш. навуч. устаноў была абавязковым этапам для таго, каб прадоўжыць навучанне або паступіць на вайсковую службу, паколькі давала неабходную падрыхтоўку (ад праграмы пач. школы да поўнага гімназічнага курса). Пасля 1917 Д.а. як сістэма спыніла існаванне. З 1960-х г. для кампенсацыі недахопаў дзярж. сістэмы сярэдняй адукацыі атрымалі распаўсюджанне спецыфічныя формы Д.а. (прыватныя ўрокі, сямейныя семінары, рэпетытарства). У 2-й пал. 1980 — пач. 1990-х г. развіццё некаторых формаў Д.а. разглядаецца як адзін з варыянтаў садзеяння індывідуалізацыі навучання, рацыянальным суадносінам дамашняй і школьнай падрыхтоўкі. Сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь прадугледжвае магчымасць самаст. атрымання грамадзянамі агульнай адукацыі з правам на дзярж. атэстацыю.

В.М.Навумчык.

Дамачаўскі строй. Святочныя ўборы дзяўчат і маладых жанчын. 1910-я г. Вёска Чэрск Брэсцкага раёна.

ДАМА́ШНЯЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, вытворчасць у сял. гаспадарцы прадуктаў для асабістага карыстання, якія вырабляюцца з сыравіны, што здабываецца ў гэтай жа гаспадарцы. У большасці народаў узнікла ў эпоху першабытнаабшчыннага ладу з фарміраваннем асн. галін вытв. дзейнасці — земляробства і жывёлагадоўлі. Развіццё залежала ад мясц. умоў і наяўнай сыравіны. Найб. раннія і універсальныя віды Д.п. — апрацоўка і выраб скуры, лямцу, дрэва, кары, вяровак, віццё кошыкаў, сетак, пасудзін з сцёблаў, валасоў, валакна і інш. сыравіны стала пачаткам развіцця тэкстыльнай прам-сці. Пляценне з валакна дало пачатак прадзенню, потым ткацтву. Вялікае госп. значэнне мела ганчарства. Д.п. была састаўной часткай эканомікі дакапіталіст. спосабаў вытв-сці. Злучэнне сял.

Б.**Дамашнікаў**. Стадыён. 1964.

промыслаў з патрыярхальным натуральным земляробствам было тыповым для сярэдневякоўя. У эпоху развітога феадалізму Д.п. перарасла ў рамяство. У сучасных умовах Д.п. захавалася ў некат. раёнах Афрыкі, Цэйлона, Індыі, Лацінскай Амерыкі і інш. На тэр. Беларусі сустракаецца ў выглядзе нар. промыслаў.

ДАМА́ШЫЦЫ, балота на ПдЗ Пінскага р-на Брэсцкай вобл., у вадазборы р. Піна. Нізіннага тыпу. Пл. 5,9 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 3,9 тыс. га. Глыб. торфу да 3,8 м, сярэдняя 1,6 м. Паўн. ч. балота асушана, выкарыстоўваецца пад ворыва і сенажаць. Паўд. ч. ў натуральным стане. Растуць вярба, сітнік, асокі; часткова выкарыстоўваецца пад сенажаць.

ДАМАШО́ВІЧ Уладзімір Максімавіч (17.2.1928, в. Вадзяціна Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. пісьменнік. Засл. работнік культуры Беларусі (1992). Скончыў БДУ (1953). Працаваў у выд-вах, час. «Полымя» і «Маладосць». Друкуецца з 1958. Асн. тэмы апавяданняў і аповесцей — жыццё сялян Зах. Беларусі, барацьба супраць ням.-фаш. захопнікаў, пасляваен. адбудова, маральныя праблемы сучаснага вясковага і гарадскога жыцця, каханне (зб-кі «Заклінаю ад кулі», 1960, «Між двух агнёў», 1963, «Абуджэнне», 1968, «У лабірынце вуліц», 1979, аповесць-хроніка «Парахам пахла зямля», 1973, дакумент. аповесць «Першым заўсёды цяжка», 1986, з У.Сазановічам). Раман «Камень з гары» (1990) пра падзеі 1950—60-х г., калі быў развянчаны культ асобы. Героі твораў Д. — людзі сумленныя і працалюбівыя, мужна імкнуцца да праўды і справядлівасці, высокага маральнага ідэалу. Проза пісьменніка злабадзённая па тэматыцы, псіхалагічна паглыбленая, стрыманая ў фарбах, вылучаецца жывой нар. мовай. За аповесць «Кожны чацвёрты» (1991) Літ. прэмія імя І.Мележа 1992. Пераклаў на бел. мову раман Е.Путраманта «Верасень» (з Я.Міско), апавяданні К.Федзіна, Ю.Нагібіна, У.Салаухіна і інш.

Тв.: Выбранае. Мн., 1977; Выбр. творы. Мн., 1988.

Літ.: Александровіч С. У пошуках гераічнага і незвычайнага // Полымя. 1960. № 8; Ярош М. Творчы неспакой пісьменніка // Там жа. 1963. № 12; Няхай М. Пара творчай сталасці // Бел. літаратура. Мн., 1979. Вып. 7; Тычына М. Змена квадры. Мн., 1983. *І.У.Саламевіч.*

ДАМАШЭ́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Шчара, за 7 км на ПнЗ ад г. Баранавічы. Пл. 0,25 км^2, даўж. 550 м, найб. шыр. 500 м. Праз ручай і сістэму меліярац. каналаў злучана з р. Шчара.

ДА́МБА (галанд. dam), гідратэхнічнае збудаванне ў выглядзе насыпу, будовай аналагічнае земляной *плаціне*. Бываюць напорныя і безнапорныя. Выкарыстоўваюцца для аховы ад затаплення і падтаплення с.-г. угоддзяў, населеных пунктаў, прамысл. аб'ектаў (Д. абвалавання), для рэгулявання рэчышчаў, прадухілення іх размываў, адкладання наносаў (рэгулявальныя Д.).

Д. абвалавання будуюць з мясц. грунтоў, яны могуць умацоўвацца каменным накідам, бетоннымі або жалезабетоннымі плітамі, мець проціфільтрацыйныя ядро або экран з гліністых грунтоў ці поліэтыленавай плёнкі, дрэнаж. Рэгулявальныя Д. будуюць з каменнага накіду, каркасна-камен-

У.М.**Дамашэвіч**.



А.С.**Дамбавецкі**.

ных канструкцый, фашын і інш. (гл. *Рэгуляцыйныя збудаванні*). На Беларусі вядомы з даўніх часоў. Д. робяцца пры буд-ве вадасховішчаў і водных сістэм (напр., на *Вілейска-Мінскай воднай сістэме*). *Г.Г.Круглоў.*

ДАМБАВЕ́ЦКІ Аляксандр Станіслававіч (1840 — каля 1914), бел. краязнавец, грамадскі дзеяч. Скончыў Кіеўскі ун-т. З 1872 магілёўскі губернатар, з 1893 сенатар. Ініцыятар адкрыцця ў Магілёве гіст.-этнагр. музея (1879). Пачынальнік выдання і рэдактар калектыўнай працы «Спроба апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных, прамысловых, сельскагаспадарчых, лясных, вучэбных, медыцынскіх і статыстычных адносінах» (кн. 1—3, 1882—84), дзе змешчаны матэрыялы па археалогіі, ёсць звесткі пра побыт, абрады, нар. творчасць, помнікі старажытнасці. Арганізоўваў археал. экспедыцыі па Магілёўшчыне, выстаўкі іх знаходак у Магілёве і Вільні. Садзейнічаў Е.Р.Раманаву ў падрыхтоўцы «Археалагічнай карты Магілёўскай губерні», спрыяў археал. даследаванням У.З.Завітневіча, Д.Я.Самаквасава, М.В.Фурсава, С.Ю.Чалоўскага, выданню «Дзённіка курганных раскопак...» Фурсава і Чалоўскага (1892).

Папярочныя профілі **дамбаў** абвалавання з экранам з грунтавога матэрыялу (1), з ядром (2) і з экранам з поліэтыленавай плёнкі (3).

На **Дамбайскай паляне**.

ДАМБА́ЙСКАЯ ПАЛЯ́НА, міжгорная катлавіна каля падножжа паўн. схілу Галоўнага, або Водападзельнага, хр. Вял. Каўказа, каля вытокаў р. Тэберда. Размешчана на выш. 1620 м на тэр. Тэбердзінскага запаведніка. Над Д.п. узнімаюцца горныя вяршыні да выш. 4046 м (г. *Дамбай-Ульген*). Схілы да выш. 2300 м укрыты лесам (пераважна піхта). Д.п. — раён альпінізму і турызму на Зах. Каўказе. Курортны пас. Дамбай.

ДАМБА́Й-УЛЬГЕ́Н, вяршыня ў зах. частцы Галоўнага, або Водападзельнага, хр. Вял. Каўказа, каля вытокаў р. Тэберда. Выш. 4046 м. Складзена з гнейсаў, крышт. сланцаў, граніт аў. Укрыта вечнымі снягамі і ледавікамі. Каля падножжа гары *Дамбайская паляна*.

ДАМБКО́ЎСКІ (Dąbkowski) Пшэмыслаў (23.2.1877, г. Львоў, Украіна — 18.12.1950), польскі юрыст, гісторык права. Чл. Кракаўскай АН. Праф. Львоўскага ун-та (1916). У 1925—39 выдаваў «Гістарычна-прававы дзённік» (т. 1—13) і «Гістарычна-прававы даведнік». Аўтар адзінай на сёння сістэматызаванай працы «Прыватнае польскае права» (т. 1—2, 1910—11), навук. прац па гісторыі польскага права, архівістыцы, сац.-эканам. гісторыі («Парука», 1904, «Заклад», 1905, «Спадчынная і набытая маёмасць у праве літоўскім», 1916, і інш.).

ДАМБРО́ЎСКАЯ (Dąbrowska) Марыя (6.10.1889, г. Русаў, Польшча — 19.5.1965), польская пісьменніца. У 1907—14 вучылася ў Лазанскім і Брусельскім ун-тах. Літ. дзейнасць пачала ў 1910-я г. Першыя зб-кі апавяданняў «Дзеці радзімы» (1918), «Галінка чарэшні» (1922) і «Усмешка дзяцінства» (1923) прысвечаны дзецям з іх своеасаблівым успрыманнем свету. У зб. навел «Людзі адтуль» (1926) паказаны жыццё і ўнутр. свет вясковай беднаты ў пач. 20 ст., у зб. «Прыкмета жыцця» (1938) — нялёгкае існаванне чалавека ў грамадстве. Самы вядомы твор Д. — эпічная тэтралогія «Ночы і дні» (1932—34), у якой намалявана гісторыя жыцця

адной сям'і з 1860-х г. да 1-й сусв. вайны. Аўтар гіст. драм «Геній-сірата» (1939) і «Станіслаў і Багуміл» (1945), рамана-эпапеі «Прыгоды думаючага чалавека» (незакончаны, выд. 1970), «Дзённікаў» (1—5, выд. 1988), літ.-крытычных артыкулаў (зб. «Думкі аб падзеях і людзях», 1956).

Тв.: Pisma wybrane. T. 1—3. Warszawa, 1956; Бел. пер. — у кн.: Ад Буга да Одры: Апавяданні пол. пісьменнікаў. Мн., 1969; Рус. пер. — Избранное. М., 1974. *М.М.Хмяльніцкі.*

ДАМБРО́ЎСКІ Антоній Самуэль (10.6.1774, г. п. Тураў Гомельскай вобл. — 22.6.1838), бел. жывапісец і тэатр. мастак. Вучыўся ў *Ф.Смуглевіча*. Творчую дзейнасць пачаў дэкаратарам у прыдворным т-ры М.К.Агінскага ў Слоніме ў 1880, потым працаваў у Варшаве. Аўтар фрэсак у палацах Мастоўскага і Сабалеўскага (Варшава); пісаў таксама жывапісныя карціны (партрэты, пейзажы і інш.).

ДАМБРО́ЎСКІ Юрый Восіпавіч (12.6.1909, Масква — 29.5.1978), рускі пісьменнік. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1932). У 1932 арыштаваны і высланы з Масквы ў Алматы. Працаваў у музеі. У 1930—50-я г. правёў у лагерах і ссылках каля 18 гадоў. Гісторыя ў святле маральных праблем сучаснасці ў раманах «Дзяржавін» (кн. 1, 1939), «Малпа прыходзіць па свой чэрап» (1959), кн. «Смуглая лэдзі. Тры навелы пра Шэкспіра» (1969). Механізм таталітарызму ў СССР аналізуе ў аповесці «Хавальнік старажытнасцей» (1964) і яе працягу — рамане «Факультэт непатрэбных рэчаў» (Парыж, 1978, М., 1989). У вершах Д. — драм. вопыт ахвяры рэпрэсій. Аўтар паэмы «Каменны тапор» (1939).

Тв.: Хранитель древностей: Роман. Новеллы. Эссе. М., 1991; Меня убить хотели эти суки. М., 1997.

ДАМБРО́ЎСКІ (Dąbrowski) Ян Генрык (2 ці 29.8.1755, Пяржовец, каля Кракава, Польшча — 6.6.1818), польскі ваен. дзеяч. Генерал ад кавалерыі (1815). З 1771 у саксонскай, з 1792 у польск. арміі. Удзельнік паўстання 1794, вызначыўся пры абароне Варшавы ад рас. войск. У 1796—1814 у эміграцыі (з перапынкамі). У 1797 стварыў у Італіі *легіёны польскія*. У 1806 арганізаваў антыпрускае паўстанне ў *Вялікай Польшчы*. Удзельнік напалеонаўскіх войнаў — кампаній 1806—07, 1809, 1812 (гл. ў арт. *Бабруйская абарона 1812, Бярэзінская аперацыя 1812*). У кастр. 1813 — сак. 1814 галоўнакаманд. польск. войскамі ў складзе франц. арміі. У *Каралеўстве Польскім* сенатар-ваявода. Прысвечаная яму песня легіёнаў польскіх «Мазурка Д.» — нац. гімн Польшчы. Аўтар дзённіка (1864).

Літ.: Pachoński J. Generał Jan Henryk Dąbrowski 1755—1818. Warszawa, 1981.

ДАМБРО́ЎСКІ (Dąbrowski) Яраслаў (13.11.1836, г. Жытомір, Украіна — 23.5.1871), дзеяч польск. і міжнар. рэв. руху. Вучыўся ў кадэцкіх карпусах у Брэсце (1845—53) і Пецярбургу (1853—55), Акадэміі генштаба ў Пецярбургу (1859—61). З 1855 у рас. арміі. Удзельнік *Каўказскай вайны 1817—64*. Разам з З.*Серакоўскім* узначальваў рэв. арг-цыю ў Пецярбургу (у яе ўваходзілі браты К. і В.Каліноўскія і інш. выхадцы з Беларусі і Літвы), прапагандаваў ідэі рус.-польск. рэв. саюзу. З 1862 у Варшаве, кіраўнік «*чырвоных*». Чл. Цэнтр. нац. к-та. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Камітэта рускіх афіцэраў у Польшчы*. Правёў нарады ў Вільні з рэвалюцыянерамі Літвы *і Беларусі, абавязаўся прадстаўляць іх*

Я.Г.**Дамброўскі**.



Я.**Дамброўскі**.

інтарэсы ў Варшаве. Разлічваючы на спрыяльную сітуацыю і падтрымку рас. рэв. сіл, распрацаваў план неадкладнага ўзбр. паўстання, які адхілілі правыя. У жн. 1862 арыштаваны, з турмы кіраваў падрыхтоўкай *паўстання 1863—64*. У канцы 1864 уцёк па дарозе на катаргу, выехаў за мяжу. Адзін з лідэраў польск. дэмакр. эміграцыі, кантактаваў з А.І.Герцэнам, Дж.Гарыбальдзі. Генерал і галоўнакаманд. ўзбр. сіламі *Парыжскай камуны 1871*, загінуў у баі з версальцамі. Аўтар шэрагу ваен.-тэарэт. прац.

Літ. Дьяков В. Ярослав Домбровский. М., 1969.

А.**Дам'е**. Дон Кіхот. Каля 1868.

ДАМДЗІ́НАЎ Мікалай Гармаевіч (н. 6.1.1932, улус Угнасай, Бурацыя, Рас. Федэрацыя), бурацкі пісьменнік. Нар. паэт Бурацыі (1973). Скончыў Літ. ін-т імя Горкага ў Маскве (1957). Аўтар паэт. зб-каў «Баргузін» (1955), «Чатыры небы» (1963), «Красавік» (1973, за 2 апошнія Дзярж. прэмія Расіі імя М.Горкага 1975), «На гэтай планеце» *(1979), п'ес «Даўняя справа» (1967—68)*, «Даржы Банзараў» (1969), «Кавалі перамогі» (1971), «Кальцо дзекабрыста» (1979 у вершах), кінааповесці «Пара таежнай пралескі» (1958), кніг літ.-крытычных артыкулаў. Паэзіі Д. ўласцівы эмацыянальная адкрытасць, інтэлектуальнасць, гуманізм і гіст. аптымізм.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. Т. 1—2. М., 1981.

Літ.: Очирова Т.Н. Николай Дамдинов: Лит. портрет. М., 1980.

ДАМ'Е́ (Daumier) Анарэ Віктар'ен (26.2.1808, г. Марсель, Францыя — 11.2.1879), французскі графік, жывапісец і скульптар. З 1814 жыў у Парыжы, у 1820-я г. браў урокі жывапісу і малюнка, вучыўся мастацтву літаграфіі. Аўтар востраграматэскавых карыкатур на кіруючыя вярхі грамадства, у т.л. на караля Луі Філіпа. Асновай для серыі літаграфічных партрэтаў-шаржаў «Славутасці залатой сярэдзіны» (1832—33) сталі скульпт. эскізы-бюсты паліт. дзеячаў (1830—32, захавалася 36 бюстаў). У літаграфіях 1834 Д. выкрываў бяздарнасць і своекарыслівасць улад («Заканадаўчае чэрава», «Усе мы сумленныя людзі, абдымемся»), ствараў вобразы рабочых («Сучасны Галілей», «Вуліца Транснанен 15 красавіка 1834 года» і інш.). Пасля забароны ў 1835 паліт. карыкатуры Д. звярнуўся да быт. сатары: серыя «Карыкацюрана» (1836—38), «Лепшыя ў жыцці» (1843—46), «Добрыя буржуа» (1846—49). У перыяд і пасля рэв. 1848—49 стварыў (спачатку ў статуэтцы, потым у шэрагу літаграфій) абагульнены вобраз паліт. прайдзісвета Ратапуаля. У жывапісе Д. па-наватарску пераасэнсоўваліся традыцыі *рамантызму*, трагічная велічнасць спалучалася з гратэскам, драма з сатырай, вострая характарнасць вобразаў са свабодай пісьма, смелай абагульненасцю формаў, выразнасцю пластыкі і светлавымі эфектамі. У яго карцінах адлюстраваліся пафас рэв. барацьбы («Паўстанне», каля 1848), прыгажосць простага чалавека («Прачка», каля 1859—60); улюбёнымі матывамі жывапісу былі цырк, тэатр, вандроўныя камедыянты: «Меладрама» (каля 1856—60), «Крыспэн і Скапэн» (каля 1860), серыя карцін «Дон Кіхот» (каля 1868) і інш.

Літ.: Пассерон Р. Домье: Пер. с фр. М., 1984.

ДАМЕ́ЙКА Ігнат Іпалітавіч (31.7.1802, маёнтак Мядзведка, Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 23.1.1889), геолаг,

мінералог, даследчык Чылі. Скончыў Віленскі ун-т (1822). Удзельнік паўстання 1830—31. З 1832 у Парыжы, дзе скончыў Горную школу (1836). З 1838 у Чылі, арганізаваў вывучэнне геалогіі і мінералогіі Андаў, пустыні Атакама і аўтаномнай прав. Араўканіі на Пд Чылі; заснаваў метэаралагічную службу; стварыў этнагр. музей, Горную школу ў г. Какімба (з 1838 праф.); адкрыў медныя

І.І.**Дамейка**.

і сярэбраныя капальні, арганізаваў золатаздабычу і здабычу салетры; увёў метрычную сістэму вагі і мер; напісаў падручнікі па мінералогіі і метэаралогіі. У 1866—83 абраны рэктарам ун-та ў Сант'яга. У 1884 наведаў радзіму (Мядзведка, Мір, Крошын). Чылійскі ўрад абвясціў Д. нац. героем. Яго імем названы: мінерал дамейкіт, выкапнёвы слімак, фіялка, аманіт чылійскі; горад у Араўканіі на Пд, рабочы пасёлак паблізу порта Антафагаста на Пн Чылі, хрыбет у Андах (Кардыльера-Д.); ун-т і нац. б-ка ў Сант'яга. У яго гонар выбіты медаль і пастаўлены помнік у Сант'яга. У б. фальварку Д. (в. Заполле Лідскага р-на) адкрыты музей.

Тв.: Moje podróże: Pamiętniki wygnańca. T. 1—3. Wrocław etc., 1962—63.

Літ.: Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX ст. Мн., 1969.; Szwejcerowa A. Jgnacy Domeyko. Warszawa, 1975; Wójcik Z. Jgnacy Domeyko. Warszawa; Wrocław, 1995.

В.А.Ярмоленка.

ДАМЕЙКІТ (ад прозвішча бел. геолага І.І.*Дамейкі*), мінерал, прыродны арсенід медзі, Cu_3As. Крышталізуецца ў кубічнай і гексаганальнай сінганіях з т-рай пераходу 225 °С. Агрэгаты шчыльныя, пупышка- і гронкападобныя. Колер серабрыста-белы, шэры, з жаўтавата-бурай пабегласцю. Бляск металічны. Цв. 3—3,5. Шчыльн. 7,5 г/см^3. Кроккі. Гідратэрмальнага паходжання, асацыіруе з самароднымі меддзю, серабром, сульфідамі медзі і арсенідамі нікелю, кобальту і інш.

ДА́МЕЛЬ Ян (1780, г. Елгава, Латвія — 30.8.1840), бел. жывапісец, рысавальшчык. Скончыў Віленскі ун-т (1809) і выкладаў у ім (1809—20). У 1820—22 па ілжывым абвінавачванні ў крымінальным злачынстве сасланы ў Сібір. З 1822 жыў у Мінску. Творчасць Д. сфарміравалася пад уплывам класіцызму. Майстар гіст. жанру: «Смерць князя Панятоўскага», «Смерць магістра крыжаносцаў Ульрыха фон Юнгінгена ў бітве пад Грунвальдам» (абедзве 1820-я г.), «Хрышчэнне славян», «Чарнецкі пераплывае Піліцу», «Смерць Глінскага ў няволі», «Вызваленне Т.Касцюшкі з цямніцы» (1830-я г.), «Твардоўскі паказвае Сігізмунду Аўгусту цень яго жонкі Барбары», «Напалеон на бівуаку пад Аўстэрліцам», «Цар Аляксандр I падпісвае ў Вільні амністыю», «Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.», «Разбітыя войскі Напалеона на плошчы ратушы ў Вільні» і інш. Імкнуўся дакладна аднавіць рэальную карціну падзей. У 1820 выканаў эскізы і малюнкі на тэмы вайны 1812, у 1821—22 — шматлікія (некалькі альбомаў) малюнкі і замалёўкі на тэмы побыту народаў Сібіры, партрэты («Група татар», «Партрэт Томаса дэ Берваля» і інш. з «Дзённіка падарожжа ў Сібір»), пейзажы («Захад сонца ў Табольску»), размалёўкі Евангелісцкага касцёла ў Табольску і касцёла бернардзінцаў у Томску. Аўтар

Я.**Дамель**. Аўтапартрэт.

Я.**Дамель**. Партрэт І.Л.Храптовіча (копія карціны мастака І.Грасі).

жывапісных твораў на рэліг. сюжэты (сярэдзіна 1820-х — 1830-я г.): «Святая дзева з дзіцем», «Хрыстос і самарыцянка», «Адрачэнне святога Пятра», «Палажэнне ў труну», «Маленне аб чашы», «Спакушэнне Хрыста», «Агар у пустыні». Напісаў партрэты кн. Д.Радзівіла, графаў І.Храптовіча і К.Тышкевіча, рэктара Віленскага ун-та Ш.Малеўскага, ксяндза Ф.Галанскага, «М.Равіч з сынам», «А.Горват з жонкай», «Валатковіч з жонкай», дзярж. дзеячаў М.Спяранскага, С.Строганава, Е.Кабылінскага і інш. Партрэтам уласціва тонкая псіхал. характарыстыка, некаторыя (аўтапартрэт, партрэт праф. Я.Рустэма) маюць рысы рамантызму. Аўтар пейзажаў Мінска і яго ваколіц («Вадзяны млын», «Дрэвы пад вадой»).

Літ.: Дробаў Л.Н. Беларускія мастакі XIX ст. Мн., 1971; Яго ж. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974.

ДАМЕ́Н (франц. domaine ад лац. dominium уладанне), поўная і спадчынная форма зямельнай уласнасці ў сярэдневяковых краінах Еўропы. Каралеўскі Д. узнік на аснове прысваення каралём вярх. уласнасці на зямлю племя, народа, уключаў *вотчыну*, крэпасці, гарады, угоддзі і інш.; павялічваўся за кошт канфіскаваных зямель феадалаў і царквы. На тэр. Беларусі ў 11—13 ст. існавалі даменіяльная зямельная ўласнасць і ўмоўнае землеўладанне князёў і баяр, якое ў пісьмовых крыніцах вядома як *воласць* (у краінах Зах. Еўропы наз. бенефіцыі). У ВКЛ у 14—18 ст. гаспадарскі Д. утвараўся з радавых уладанняў дынастыі вял. князёў, а таксама з прысвоеных маёнткаў інш. літ. і бел. князёў. У выніку аграрнай рэформы (гл. *Устава на валокі 1557, Валочная памера*) гаспадарскія двары былі ператвораны ў *фальваркі*, узніклі *староствы* і *эканоміі*. Сеньярыяльны Д. (баярскі, магнацкі) — частка вотчыны феадала, якая была яго непасрэднай уласнасцю і дзе ўладальнік, выкарыстоўваючы працу залежных сялян, вёў сваю даменіяльную гаспадарку.

ДАМЕ́НІКА ВЕНЕЦЫЯ́НА (Domenico Veneziano; да 1410, г. Венецыя, Італія — 15.5.1461), італьянскі жывапісец эпохі Ранняга Адраджэння. Вучыўся, напэўна, у Венецыі, з 1439 працаваў у Фларэнцыі (першым увёў тэхніку алейнага жывапісу). Пераадолеўшы традыцыі познагатычнага жывапісу, у сваіх сталых творах («Алтар св. Лучыі», каля 1445—48), паказаў сябе майстрам перспектывы і пластычнай перадачы аб'ёму. У адрозненне ад тагачасных мастакоў *фларэнційскай школы жывапісу*, аддаваў перавагу каларыстычным задачам, выкарыстоўваў колеравую гаму для перадачы эмацыянальных адценняў — серабрысты тон у яго карцінах стварае адчуванне святла і прасторы («Дабравешчанне»). Урачыстасць арнаментацыі і выразнасць контурных ліній удала спалучаліся ў кампазіцыйнай форме профільнага паяснога партрэта («Пар-

трэт маладой жанчыны», каля 1450). Сярод яго вучняў *П'ера дэла Франчэска*.

ДАМЕНІКІ́НА [Domenichino; сапр. Цамп'еры (Zampieri) Дамеціка; 21.10.1581, г. Балонія, Італія — 6.4.1641], італьянскі жывапісец-акадэміст, прадстаўнік *балонскай школы жывапісу*. Вучыўся ў Балоніі ў *Л.Карачы*. З 1602 працаваў пераважна ў Рыме. Творам Д. (фрэскі ў рымскіх цэрквах Сан-Луіджы дэі Франчэзі, 1616—17, і Сант-Андрэа дэла Вале, 1624—28; карціны «Апошняе прычасце св. Іераніма», 1614, «Паляванне Дыяны», 1617—18) уласцівы цэльная кампазіцыя, выразны ідэалізаваны малюнак, стракаты лакальны каларыт.

ДАМЕ́НЫ, вобласці хімічна аднароднага асяроддзя, якія адрозніваюцца эл., магн., пругкімі ўласцівасцямі або ўпарадкаванасцю размеркавання часціц. Утварэнне Д. звязана з фазавым пераходам крышталёў у стан з больш нізкай структурай, да соцень і тысяч міжатамных адлегласцей у ферамагн. Д. Ферамагні́тныя Д. — вобласці самаадвольнай (спантаннай) намагнічанасці; намагнічаныя да насычэння часткі аб'ёму ферамагнетыка, на якія ён распадаецца пры т-рах, меншых за *кюры пункт*; звычайна маюць памеры да 0,1 мм. Сегнетаэлектрычныя Д. — вобласці аднароднай спантаннай палярызацыі ў сегнетаэлектрыках; маюць памеры да 0,01 мм. Пругкія Д. — вобласці з рознай спантаннай *дэфармацыяй*, што ўзнікаюць у цвёрдай фазе пры яе ўтварэнні ўнутры або на паверхні інш. цвёрдай фазы; выяўляюцца пры ўпарадкаванні цвёрдых растворaў, мех. двайнікаванні і інш. Д. Гана — вобласці паўправаднікоў з розным удзельным эл. супраціўленнем і рознай напружанасцю эл. поля; утвараюцца ў паўправадніках з N-падобнай вольтампернай характарыстыкай (гл. *Гана эфект*). *П.С.Габец, П.А.Пупкевіч.*

ДАМЕСТЫКА́ЦЫЯ (ад лац. domesticus хатні), адамашніванне дзікіх відаў жывёл, ператварэнне іх у свойскіх. Працягглы працэс прыручэння, які вядзе да змен у паводзінах і анатама-марфал. бу-

Даменіка Венецыяна. Алтар св. Лучыі. Каля 1445—48.

сіметрыяй; аналіз з дапамогай тэорыі груп дазваляе выявіць усе магчымыя віды Д. пры любым фазавым пераходзе. Д. бываюць: ферамагн., сегнетаэл., пругкія, Гана, у вадкіх крышталях і інш.

Вобласць, у якой адбываецца паступовы пераход ад аднаго Д. да другога, наз. мяжой Д. (даменнай сценкай); яе характэрная таўшчыня залежыць ад тыпу фазавага пераходу — ад некалькіх міжатамных адлегласцей для Д., якія адрозніваюцца атамна-крышталічнай

дове жывёл. Паводле звестак археалогіі, раней за іншых былі прыручаны сабака (каля 10—5 тыс. г. да н.э.) і свіння (каля 8—3 тыс. г. да н.э.), потым каза, авечка, буйн. раг. жывёла, пазней конь, алень. У параўнанні з дзікімі жывёламі у свойскіх больш лёгкі шкілет, менш трывалыя косці, танчэйшая скура. Змяніліся і ўнутр. органы: менш, чым у дзікіх, развіты лёгкія, сэрца, ныркі, але лепш функцыянуюць млечныя залозы,

Даменікіна. Паляванне Дыяны. Фрагмент. 1617—18.

вышэйшая пладавітасць; у многіх жывёл знікла сезоннасць у расплоджванні. Працэс Д. працягваецца: прыручаюцца ласі, лісы, норкі, нутрыі і інш.

ДАМІНА́НТА [ад лац. dominans (dominantis) пануючы] у фізіялогіі



а

б

Дамены: *а* — сегнетаэлектрычныя; *б* — ферамагнітныя (парашковыя фігуры на паверхні крышталя крамяністага жалеза). Стрэлкамі паказаны напрамак вектара палярызацыі (намагнічанасці).

часовы пануючы ачаг узбуджэння ў ц.н.с., які ахоплівае адзін ці некалькі цэнтраў і вызначае характар рэакцыі арганізма ў адказ на вонкавыя або ўнутр. раздражняльнікі. Вучэнне аб Д. як агульным прынцыпе работы нерв. цэнтраў, сфармуляваў А.А.*Ухтомскі* (1911—23). Д. вылучаецца высокай устойлівай узбудлівасцю, здольнасцю прыцягваць, акумуляваць і падсумоўваць сігналы, што паслядоўна паступаюць, а таксама тармазіць рэакцыю інш. нерв. цэнтраў на прызначаныя ім імпульсы. Гэта дазваляе, напр., у працэсе творчай дзейнасці цалкам «паглыбіцца ў працу», сканцэнтраваць на ёй усю ўвагу, адцягнуцца ад пабочных раздражняльнікаў. Д. складаецца пад уплывам рэфлекторнай актыўнасці, уздзеяння гумаральных фактараў і з'яўляецца асновай фарміравання матывацыйных паводзін (харчовых, палавых і інш.). У эксперыменце Д. можа быць створана непасрэдным уздзеяннем на нерв. цэнтры слабым эл. токам або некат. фармакалагічнымі рэчывамі. Д. ў вышэйшых цэнтрах галаўнога мозга з'яўляецца фізіял. асновай шэрагу складаных псіхічных з'яў. *У.М.Калюноў.*

ДАМІНА́НТА ў м у з ы ц ы, назва гуку 5-й ступені ладу; у *гармоніі* — адна з *функцый танальных* у мажоры і міноры, якая валодае інтэнсіўным імкненнем да *тонікі*. Аснова акордаў Д. — трохгучча 5-й ступені ладу. Функцыю Д. (D) выконваюць і акорды, якія будуюцца на VII і III ступенях, а таксама розныя відазмяненні асн. акорда (дабаўленне дысанансаў, лінеарных і заменных тонаў, увядзенне альтэрацыі, пропуск прымы і інш. тонаў), некат. падобныя па ролі ў танальнасці акорды (напр., «дубль-Д.» — акорд з павялічанай секстай на нII ступені).

ДАМІНА́НТНАСЦЬ, д а м і н а в а н н е, пераважнае дзеянне аднаго з пары бацькоўскіх *генаў* у гібрыдным арганізме. Выяўляецца ў тым, што дамінантны *алель* (адзін з пары гамалагічных, альтэрнатыўных генаў) больш моцна ўплывае на развіццё адпаведнай прыкметы асобіны, чым другі, рэцэсіўны алель. Ступень праяўлення Д. любой прыкметы ў *фенатыпе* залежыць ад *генатыпу* арганізма, г.зн. ад дзеяння многіх генаў у пэўных умовах асяроддзя. Адрозніваюць поўную Д., звышдамінантнасць і паўдамінантнасць, ці прамежкавую Д. Поўная Д., як і поўная *рэцэсіўнасць*, з'ява рэдкая. У выпадку поўнай Д. арганізм можа несці ў рэцэсіўным стане шкодныя алелі. Для аналізу гэтых з'яў у жывёлагадоўлі выкарыстоўваюць метад выпрабавання вытворнікаў па патомстве. Наяўнасцю Д. часткова тлумачыцца тое, што патомак можа быць больш падобны да аднаго з бацькоў, нягледзячы на аднолькавы ўклад абодвух у яго генетычную канстытуцыю (гл. *Мендэля законы*).

ДАМІНА́Т (ад лац. dominatus панаванне), неабмежаваная манархія, устаноўленая ў Стараж. Рыме замест *прынцыпату* ў часы імператара *Дыяклетыяна* [284—305]. Д. характарызаваўся ўзмацненнем абсалютнай улады імператара, якому надаваліся рысы бажаства. Сенат страціў самаст. паліт. значэнне. Пры двары быў уведзены цырыманіял на ўсх. ўзор (напр., знакі пашаны імператару аказваліся стоячы на каленях).

ДАМІ́НГА (Domingo) Пласіда (н. 21.1.1941, Мадрыд), іспанскі спявак (тэнар). З сям'і акцёраў і спевакоў — выканаўцаў сарсуэл. Вучыўся ў бацькоў і ў кансерваторыі ў Мехіка. З 1966 выступае ў буйнейшых т-рах свету, з 1968 саліст т-ра «Метраполітэн-опера»; спявае і ў т-ры «Ла Скала». Адзін з буйнейшых прадстаўнікоў стылю *бельканта*, выконвае лірычныя і драм. партыі: Атэла, Радамес, Альфрэд, Дон Карлас («Атэла», «Аіда», «Травіята», «Дон Карлас» Дж.Вердзі), Каварадосі, Калаф, Рэнэ дэ Грые («Тоска», «Турандот», «Манон Леско» Дж.Пучыні), Вертэр у аднайм. операх Вердзі і Ж.Маснэ. Яго выкананне вылучаецца вышэйшым сінтэзам акцёрскага і вак. майстэрства, натуральнай, спантаннай эмацыянальнасцю. Выступае як оперны дырыжор, здымаецца ў кіно («Травіята», 1983). Аўтар кн. «Мае першыя сорак гадоў» (рус. пер. 1989).

П.**Дамінга** ў ролі Калафа.

ДАМІНІЁН (англ. dominion ад лац. dominium уладанне), аўтаномнае ўладанне ў складзе *Брытанскай імперыі*. Дзяржава-Д. прызнавала сваім кіраўніком брыт. манарха, якога прадстаўляў *генерал-губернатар*, мела ўнутр. самакіраванне (уласныя парламент і ўрад). Суверэнітэт Д. канчаткова замацаваны паводле *Вестмінстэрскага статута 1931*. Статус Д. атрымалі Канада (1867), Аўстрал. Саюз (1901), Новая Зеландыя (1907), Паўд.-Афр. Саюз (1910), Ньюфаўндленд (1917), Ірландыя (1921, без Ольстэра), Індыя, Пакістан (абое ў 1947). У 1947—52 у сувязі са станаўленнем брыт. *Садружнасці* паняцце Д. заменена на «член Садружнасці».

ДАМІНІ́КА (Dominica), С а д р у ж н а с ц ь Д а м і н і к і (Commonwealth of Dominica), дзяржава на аднайм. востраве ў Карыбскім м. Падзяляецца на 10 раёнаў. Пл. 751 км^2. Нас. 88 тыс. чал. (1994). Сталіца — г. *Разо*. Афіц. мова — англійская, пашыраны таксама мясц. дыялект франц. мовы. Нац. свята — Дзень незалежнасці (3 ліст.).

Прырода. Паверхня вострава гарыстая (выш. да 1447 м, вулкан Д'яблатэн). Ёсць гарачыя крыніцы і невял. азёры з кіпячай вадой. Бываюць землетрасенні. Клімат трапічны пасатны, вільготны. Сярэднямесячная т-ра 25—27 °С. Ападкаў 1500—2500 мм за год, дажджлівы сезон чэрв.—кастр., частыя ўраганы. У гарах захаваліся вільготна-трапічныя лясы з каштоўнымі пародамі дрэў. Нац. парк Морн-Труа-Пітон.

Герб і сцяг Дамінікі.

Насельніцтва. 91% складаюць негры, 6% — мулаты і крэолы, 1,5% — індзейцы-карыбы (карэнныя жыхары). Сярод вернікаў пераважаюць католікі (93%). Сярэдняя шчыльн. насельніцтва 117 чал. на 1 км^2, амаль усё яно жыве на ўзбярэжжы. У гарадах каля 50% насельніцтва.

Гісторыя. Адкрыта Х.Калумбам у 1493. У 17—18 ст. Д. папераменна валодалі Францыя і Англія. Канчаткова стала калоніяй Вялікабрытаніі паводле *Парыжскага міру 1783*. У 1871—1939 у складзе Федэрацыі Падветраных а-воў, у 1958—62 — Вест-Індскай федэрацыі. У 1967 аб'яўлена «асацыіраванай з Вялікабрытаніяй дзяржавай». 3.11.1978 абвешчана незалежнасць Д. Восенню

1983 удзельнічала ў інтэрвенцыі ЗША на Гранаду. З сярэдзіны 1980-х г. у Д. ажыццяўляецца праграма паліт. інтэграцыі з карыбскімі краінамі. Д. — чл. *Садружнасці* на чале з Вялікабрытаніяй. Паводле канстытуцыі 1978 кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт (з 1993 — К.Сараінда), які выбіраецца парламентам на 5 гадоў. Заканад. ўлада належыць аднапалатнаму парламенту — Палаце сходу, выканаўчая — ураду. У 1978 Д. прынята ў ААН. Чл. Арг-цыі амер. дзяржаў, Карыбскай супольнасці і Арг-цыі ўсходнекарыбскіх дзяржаў. Паліт. партыі: Партыя свабоды Д. (правячая), Аб'яднаная партыя працоўных Д., Лейбарысцкая партыя Д. Прафсаюзы — Аб'яднаны саюз рабочых Д., Прафсаюз Д., Асацыяцыя дзярж. служачых, Прафсаюз докераў і рабочых сумежных прафесій, Саюз сялян Д.

Гаспадарка. Найб. развіта сельская гаспадарка. Яе доля ў валавым унутр. прадукце каля 30%, прам-сці — каля

6%. Апрацоўваецца каля $^1/_4$ тэрыторыі. Гал. культура — бананы (збор штогод каля 40—50 тыс. т). Вырошчваюць какосавыя арэхі, цытрусавыя, какаву, агародніну. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак і коз. Лесанарыхтоўкі. Здабыча пемзы і вапняку. Апрацоўчая прам-сць прадстаўлена паўсаматужнымі прадпрыемствамі па вытв-сці сокаў, фруктовых кансерваў, копры, цыгарэт (з імпартнага тытуню), рому, мыла, эфірных алеяў і інш. Ёсць некалькі дрэваапр. прадпрыемстваў, цэментны з-д. Шырока развіты замежны турызм (занята 20% рабочай сілы). Рыбалоўства. Транспарт аўтамабільны (аўтадарог 752 км) і марскі. Гал. порт Разо. Міжнар. аэрапорт. Экспарт: бананы, мыла, цытрусавыя, сокі з садавіны, какосавы алей. Імпарт: харч. і прамысл. тавары, машыны і абсталяванне, хімікаты. Асн. гандл. партнёры: Вялікабрытанія, ЗША, суседнія краіны. Д. залежыць ад знешняй эканам. дапамогі. Грашовая адзінка — усходнекарыбскі долар.

І.Я.Афнагель (прырода, гаспадарка).

ДАМІНІКА́НСКАЯ РЭСПУ́БЛІКА (República Dominicana), дзяржава ў Вест-Індыі, займае ўсх. ч. в-ва *Гаіці* і суседнія невял. астравы, на З мяжуе з Рэспублікай Гаіці. Падзяляецца на 26 правінцый і 1 акругу. Пл. 48,4 тыс. км^2. Нас. 7543 тыс. чал. (1993). Сталіца — г. *Санта-Дамінга*. Дзярж. мова — іспанская. Нац. свята — Дзень незалежнасці (27 лют.).

Дзяржаўны лад. Д.Р. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1966. Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца на 4 гады. Заканад. орган — двухпалатны Нац. кангрэс, які складаецца з сената (30 чал.) і палаты дэпутатаў (120 чал.). Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад на чале з прэм'ер-міністрам.

Прырода. Каля палавіны тэр. занята гарамі. У цэнтр. ч. краіны з ПнЗ на ПдУ цягнецца Кардыльера-Сентраль з найвышэйшым пунктам 3175 м (г. Дуартэ). Уздоўж паўн. ўзбярэжжа вапняковыя горы Кардыльера-Септэнтрыяналь, выш. да 1249 м. Паміж хрыбтамі і на ўзбярэжжы ўрадлівыя даліны. З карысных выкапняў ёсць баксіты, жал., медныя і нікелевыя руды, серабро і золата, буд. матэрыялы і інш. Клімат трапічны, пасатны. Т-ра паветра 23—25 °С у студз., 28—29 °С у ліпені. Ападкаў 1000—2000 мм за год, пераважна з мая да лістапада. Бываюць ураганы. Рэкі невял. горныя, часткова выкарыстоўваюцца на арашэнне. На ПдЗ у бяссцёкавай катлавіне на 46 м ніжэй узр. м. ляжыць салёнае воз. Энрыкільё. У гарах трапічныя лясы (22% тэр.), пераважна лістападныя з каштоўнымі пародамі дрэў. У больш сухіх раёнах (асабліва на ПдЗ) саванны і кустовыя зараснікі. Да выш. 600 м схілы гор пад плантацыямі трапічных культур. Нац. паркі — Армандэ-Бермудэс, Дэль-Эстэ, Лос-Айтысес.

Насельніцтва. Большасць насельніцтва дамініканцы. Мулатаў 60%, белых 28%, неграў 12%. Ёсць невял. групы выхадцаў з суседніх краін, еўрапейцаў, японцаў і кітайцаў. 95% вернікаў каталікі. Сярэдняя шчыльн. насельніцтва 155,9 чал. на 1 км^2. Асабліва шчыльна заселены міжгорныя даліны і наваколле сталіцы. У гарадах жыве больш за 60% насельніцтва. Найб. з іх (тыс. ж., 1991): Санта-Дамінга — 2400, Сант'яга — 490, Ла-Рамана — 101.

Гісторыя. Да канца 15 ст. востраў насялялі індзейскія плямёны. Пасля адкрыцця вострава Х.Калумбам (1492) яго ўсх. ч. (цяперашняя тэр. краіны, назву атрымала ад г. Санта-Дамінга) да 1795 была калоніяй Іспаніі, потым Францыі, з 1809 зноў Іспаніі. У *вайну за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы 1810—26* Санта-Дамінга 20.11.1821 абвясціла незалежнасць і далучылася да рэспублікі Вял. Калумбія. У 1822 акупіравана суседняй Гаіці. У 1844 у выніку антыгаіцянскага паўстання стала незалежнай і атрымала сучасную назву. У 1861 ёю зноў завалодала Іспанія. У выніку барацьбы за незалежнасць у 1865 іспанцы пакінулі Д.Р. З сярэдзіны 19 ст. ў краіну пачаў пранікаць замежны капітал. У 1905—40 ЗША усталявалі свой кантроль над мытнямі Д.Р., што палегчыла ім умяшанне ў паліт. жыццё краіны. Калі ў 1916 у Д.Р. адбылося паўстанне, амер. войскі акупіравалі краіну і ўстанавілі ваенна-акупац. рэжым (да 1924). У 1930 да ўлады прыйшоў Р.Л.Трухільё, прадстаўнік буйных памешчыкаў і буржуазіі, звязанай з ЗША, і ўстанавіў жорсткі паліт. тэрор.

Пасля 2-й сусв. вайны, ва ўмовах уздыму нац.-вызв. барацьбы ў Лац. Амерыцы, узмацнілася барацьба супраць рэжыму Трухільё (забіты ў 1961). У снеж. 1962 на ўсеагульных выбарах перамог Х.Бош. Яго ўрад у крас. 1963 прыняў канстытуцыю, якая абвясціла агр. рэформу, шэраг паліт. і дэмакр. свабод, ажыццявіў мерапрыемствы па ўмацаванні нац. эканомікі і аслабленні залежнасці ад ЗША. У вер. 1963 рэакц. ваеншчына скінула ўрад Боша. Уладу захапіла хунта і абвясціла надзвычайнае становішча, забараніла ўсе дэмакр. партыі, прагрэс. друк, разграміла прафсаюзы. Нар. паўстанне ў крас. 1965 скінула хунту. Канстытуцыйны ўрад узначаліў Ф.Кааманьё. ЗША высадзілі ў Д.Р. дэсант (42 тыс. чал.). Урад Кааманьё быў скінуты, часовым прэзідэнтам назначаны Э.Г.Гадой. На выбарах у чэрв. 1966, якія адбываліся ва ўмовах ваен. акупацыі краіны, перамог заснавальнік і лідэр Рэфармісцкай партыі Х.Балагер (прэзідэнт у 1966—78 і з 1986). У 1966 ЗША вывелі свае войскі з тэр. краіны. Д.Р. — чл. ААН з 1945, чл. Арг-цыі амер. дзяржаў, Лацінаамер. эканам. сістэмы і інш. міжнар. арг-цый. Акрамя правячай Рэфармісцкай сац.-хрысц. партыі (створана ў 1986 у выніку зліцця Рэфармісцкай і Рэв. сац.-хрысц. партый) у краіне дзейнічаюць Дамініканская партыя вызвалення, Дамініканская рэв. партыя, Дамініканская кампартыя і інш. Прафс. аб'яднанні — Аўт. канферэнцыя хрысц. прафсаюзаў,



Герб і сцяг Дамініканскай Рэспублікі.

Усеагульная канфедэрацыя працоўных, Нац. канфедэрацыя дамініканскіх працоўных, Прафс. рух рабочага адзінства і інш.

Гаспадарка. Д.Р. — агр. краіна. У сельскай гаспадарцы занята 50% рабочай сілы. Доля ў валавым унутр. прадукце: сельскай гаспадаркі (разам з лясной прам-сцю і рыбалоўствам) — каля 17%, горназдабыўной прам-сці — каля 5, апрацоўчай прам-сці — каля 17, буд-ва — каля 6, гандлю — каля 16, сферы паслуг — каля 40%. Апрацоўваецца 30% тэрыторыі. Характэрна наяўнасць буйнога памешчыцкага землеўладання і дробных сял. гаспадарак (50% гаспадарак маюць надзелы менш за 1 га). Асн. таварныя культуры: цукр. трыснёг, какава, кава, тытунь, бананы, манга, апельсіны. На свае патрэбы вырошчваюць кукурузу, памідоры, фасо-

лю, рыс, маніёк, батат. Пашавая жывёлагадоўля. Пагалоўе (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы каля 2400, свіней 1000, коз 300. Рыбалоўства і промысел крэветак, гал. цэнтры на паўн. узбярэжжы. Аснова прам-сці — перапрацоўка цукру, кавы, какавы, тытуню, мяса, агародніны. Выт-сць электраэнергіі каля 4 млрд. кВт·гадз штогод. Здабыча баксітаў, жал., нікелевай руд, золата (штогод каля 10 т), серабра (каля 35 т), кухоннай солі. У апрацоўчай прам-сці больш за 80% аб'ёму выт-сці прыпадае на спажывецкія тавары. Найб. развіта харчасмакавая прам-сць (каля $^2/_3$ кошту прамысл. прадукцыі), пераважна цукр. (штогадовая выт-сць цукру-сырцу каля 1,5 млн. т) і тытунёвая. Цэм., хім., фармацэўтычная, тэкст., дрэваапр. прадпрыемствы. Каля 20 свабодных эканам. зон, дзе развіта швейная прам-сць. Нікелевы камбінат у г. Банао, нафтаперапр. з-д каля г. Санта-Дамінга. Значны даход прыносіць замежны турызм. Штогод краіну наведвае 1,7—2 млн. турыстаў, пераважна з ЗША. Турысцкі сезон у ліст.—маі. Унутр. транспарт у асноўным аўтамабільны, даўж. аўтадарог 17,1 тыс. км. Чыгунак 1,2 тыс. км. Гал. марскі порт — Санта-Дамінга. Экспарт: цукар (20—30% кошту), золата і серабро (каля 20%), феранікель, кава, какава, тытунь і інш. Імпарт: нафта і нафтапрадукты (34%), прамысл. тавары (28%), машыны і трансп. сродкі (20%), харч. прадукты (15%). Асн. гандл. партнёры: ЗША (48% экспарту і 43% імпарту), Венесуэла, Нідэрланды. Грашовая адзінка — дамініканскае песа.

Літ.: Кремер Т.И. Доминиканская республика: Очерк полит. истории (60—70-е гг.). М., 1980. *У.Я.Калаткоў* (гісторыя).

ДАМІНІКА́НЦЫ (позналац. dominicani або fratres praedicatores браты-прапаведнікі), каталіцкі манаскі жабрацкі ордэн. Створаны ў пач. 13 ст., зацверджаны папам у 1216. Заснавальнік іспанец Дамінік дэ Гусман. Галоўны накірунак ордэна — прапагандысцка-місіянерская дзейнасць. У 1232 Д. была даручана інквізіцыя. Жабрацкі характар ордэна не заўсёды вытрымліваўся, у 1475 і 1477 Д. афіцыйна дазволена валодаць маёмасцю і мець сталыя крыніцы прыбытку. Папства выкарыстоўвала ордэн у барацьбе з ерасямі, свецкімі ўладамі, рэфармацыйным рухам. Д. ўзначальвалі кафедры ў многіх ун-тах сярэдневяковай Еўропы. У Беларусі з'явіліся ў пач. 16 ст., на пач. 19 ст. мелі тут больш за 40 кляштараў і рэзідэнцый, дзейнічаў *Забельскі дамініканскі калегіум*. Вядомы жаночы кляштар Д. у Навагрудку. У 1830—60-я г. кляштары Д. у Беларусі зачынены, жылыя іх будынкі прыстасаваны пад казармы, шпіталі і інш., касцёлы сталі парафіяльнымі або перададзены праваслаўнай царкве. *Ю.В.Бажэнаў.*

ДАМІНІКО́ЎСКІ Фёдар Мікалаевіч (24.1.1905, г. Глыбокае Віцебскай вобл. — 8.4.1949), бел. гісторык, вучоны ў галіне с.-г. навук. Канд. с.-г. н. (1935). Скончыў Варонежскі ун-т (1927). З 1929 у Цэнтр. хім. лабараторыі Бел. НДІ сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна (з 1933 у складзе Глебавага ін-та АН БССР). У 1934 ва Усесаюзным ін-це збожжавай гаспадаркі ў Сараташе. З 1935 у Маскве ў Ін-це паўн. збожжавай гаспадаркі. Удзельнік абароны Масквы ў Вял. Айч. вайну. З жн. 1943 заг. кафедры БДУ, адначасова (з 1944) вучоны сакратар савета ун-та. Даследаваў гісторыю навукі і культуры Беларусі, аўтар больш як 200 артыкулаў біябібліягр. слоўніка «Выдатныя дзеячы беларускай зямлі» (1945—47, рукапіс у аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтр. навук. б-кі імя Я.Коласа АН Беларусі).

В.У.Скалабан.

ДАМІНО́ (франц. і італьян. domino ад лац. dominus пан), 1) маскарадны касцюм у выглядзе плашча з рукавамі і капюшонам, а таксама чалавек у такім касцюме. 2) Плашч з капюшонам у каталіцкіх манахаў. 3) Настольная гульня ў пластмасавыя або касцяныя пласцінкі, на якіх нанесены кропкі (ачкі), а таксама набор пласцінак для гэтай гульні (28 шт.).

ДАМІЦЫЯ́Н Ціт Флавій (Titus Flavius Domitianus; 24.10.51, Рым — 18.9.96), рымскі імператар [81—96]. Апошні з дынастыі *Флавіяў*, малодшы сын *Веспасіяна*. У 83 перамог герм. племя хетаў, арганізаваў буд-ва ліметса (сістэма гран. умацаванняў), засн. правінцыі Ніжняя і Верхняя Германія. У 85—92 вёў барацьбу на Дунаі супраць цара дакаў *Дэцэбала*, у 89 вымушаны быў заключыць мір, паводле якога рымляне абавязваліся выплачваць дакам штогоднюю даніну. Праводзіў самадзяржаўную палітыку, абмяжоўваў уплыў сената, абапіраўся на саслоўе коннікаў і войска, загадаў называць сябе «гаспадаром і богам», што выклікала апазіцыю сената. Забіты ў выніку змовы і праклятый сенатам. Біяграфія Д. выкладзена *Светоніем*.

ДАМІ́ЯН Лівій Сцяпанавіч (13.3.1935, с. Лядавены Рышканскага р-на, Малдова — 20.7.1986), малдаўскі паэт. У паэт. зб-ках «Прадказанні» (1965), «Карані» (1966; Рэсп. літ. прэмія імя М.Астроўскага 1966), «Дзеяслоў» (1968), «У хованкі з травой» (1972), паэмах «Наша доля — палёт» (1974), «Гордасць і цярпенне» (1977), «Сэрца і гром» (1981), «Ценявы вянец» (1982) і інш. выявіў сябе як лірык медытатыўнага складу, арганічна звязаны са сваёй эпохай. Эстэтычныя і этычныя прынцыпы Д. ў кнізе публіцыстычных нарысаў і эсэ «Задумлівыя вароты» (1975). На бел. мову творы Д. пераклалі Г.Бураўкін, Т.Бондар, Я.Янішчыц.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Гронкі радасці. Мн., 1986; Рус. пер. — Тяжесть крыльев. М., 1988.

ДАМІ́ЯНІ (Damiani) Даміяна (н. 23.7.1922, Пасьяна ды Пардэноне, Італія), італьянскі кінарэжысёр. Вучыўся ў Міланскай акадэміі прыгожых мастацтваў. З 1953 у кіно. У яго творчасці спалучаліся дзве тэндэнцыі — цікавасць да сац. і псіхал. праблем грамадства і цяга да востраскжэтнага фільма з напружаным дзеяннем. Пазней яны аб'ядналіся ў серыі фільмаў пра сіцылійскую мафію і яе сувязь з палітыкамі: «Дзень савы» (1967, у сав. пракаце «Сава з'яўляецца днём»), «Прызнанне камісара паліцыі пракурору рэспублікі» (1971), «Следства скончана — забудзьцеся» (1972), «Чаму забіваюць суддзяў» (1975), «Я баюся» (1977), «Чалавек на каленях» (1979), «Папярэджанне» (1980; у сав. пракаце «Следства з рызыкай для жыцця») і інш. У сваіх фільмах Д. новымі маст. сродкамі прадаўжае традыцыі неарэалізму.

ДАМКРА́Т (галанд. dommekracht), пераносны, перасоўны або стацыянарны механізм для пад'ёму грузаў на невялікую (звычайна да 2 м) вышыню. Бываюць рэечныя (рычажныя і зубчастыя), вінтавыя, гідраўлічныя і пнеўматычныя, ручныя і маторныя. Грузападымальнасць ад некалькіх кілаграмаў да соцень тон. Выкарыстоўваюцца пры будаўнічамантажных, рамонтных і пагрузачна-разгрузачных работах, на аўтамаб. і чыг.

транспарце. Магутнымі Д. можна падняць цэлае збудаванне на вышыню ў некалькі метраў.

ДАМО́ДАР, рака ў Індыі, у штатах Біхар і Зах. Бенгалія. Даўж. 580 км, пл. бас. больш за 20 тыс. км^2. Пачынаецца на плато Чхота-Нагпур, сярэдняе і ніжняе цячэнне — на Інда-Гангскай раўніне, упадае ў рукаў дэльты р. Ганг—Хуглі. Гал. прыток — р. Баракар (левы). Сярэдні расход вады 330 м^3/с. Летняя паводка. Суднаходная ў ніжнім цячэнні. У бас. Д. — ГЭС, вадасховішча, арашальныя каналы.

«ДАМО́КЛАЎ МЕЧ», выраз, які абазначае пастаянную небяспеку. Паводле стараж.-грэч. падання, Дамокл, фаварыт сіракузскага тырана Дыянісія I Старэйшага, лісліва называў яго самым шчаслівым з людзей. Каб паказаць нетрываласць свайго шчасця, Дыянісій у час святочнага балявання пасадзіў Дамокла на сваё месца і павесіў над яго



Тыпы **дамкратаў**: 1 — вінтавы на палазах; 2, 5 — гідраўлічныя бесперапыннага дзеяння; 3 — гідраўлічны; 4 — рэечны з зубчастай перадачай; 6 — рычажна-рэечны; 7 — вінтавы; 8 — паравозны.

галавой на конскім воласе востры меч — сімвал небяспекі.

ДА́МПІР (Dampier) Уільям (8.6.1652, Іст-Кокер, Вялікабрытанія — сак. 1715), англійскі мараплавец, пірат. Здзейсніў 3 кругасветныя плаванні. Некалькі гадоў правёў на в-ве Тарцю (на Пн ад Гаіці) у Вест-Індыі (гал. база піратаў у Атлантыцы), удзельнічаў у рабаванні ісп. гарадоў і паселішчаў на берагах Амерыкі. Плаваў да берагоў паўн.-зах. Аўстраліі, дзе адкрыў шмат невял. астравоў, у т.л. архіпелаг Дампір. Склаў апісанне і карты для паўд. раёнаў Ціхага ак. На аснове сваіх дзённікаў напісаў шэраг кніг, у якіх прывёў звесткі пра велічыні магн. нахілу ў розных пунктах Сусветнага ак., салёнасці марскіх вод, сувязі паміж пануючымі цячэннямі і вятрамі. Яго імем названы п-аў Дампіра Зямля у Аўстраліі, некалькі астравоў і праліваў у паўд.-зах. ч. Ціхага ак. і ў Малайскім архіпелагу.

ДАН Ікума (н. 7.4.1924, Токіо), японскі кампазітар. Скончыў Такійскую школу музыкі (1945; цяпер Такійскі ун-т прыгожых мастацтваў і музыкі). У 1947—50 выкладаў у Такійскай кансерваторыі. У 1953 арганізаваў авангардысцкі гурток «Група трох» (з Я.Акутагава і Т.*Маюдзумі*). Працуе практычна ва ўсіх муз. жанрах. Сярод твораў: 4 оперы, найб. папулярная «Юдзуру» («Журавліныя пёры»; паст. 1952), балет, кантаты, 5 сімфоній (1950—65), concerto grosso, камерна-інстр. творы, хары, вак. цыклы, песні і інш. Аўтар муз.-крытычных прац.

ДАНАІ́ДЫ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі 50 дачок аргоскага цара Даная. Супраць сваёй волі і волі бацькі яны павінны былі выйсці замуж за стрыечных братоў. Д. ўцяклі з бацькам у Аргас, але юнакі іх дагналі. Данай вымушаны быў згадзіцца на шлюб, але дочкам загадаў забіць жаніхоў у шлюбную ноч. Усе, акрамя Гіпермнестры, зрабілі гэта. У пакаранне Д. павінны былі ў Аідзе вечна напаўняць вадой бяздонную бочку. У пераносным сэнсе «бочка Д.» ці «работа Д.» — бессэнсоўная і бясконцая праца.

ДАНА́ЙЦАЎ ДАРЫ́, выраз, які абазначае каварную паслугу з мэтай прычыніць зло, загубіць. У гамераўскім эпасе ўдзельнікі *Траянскай вайны* данайцы, не ўзяўшы *Трою* штурмам, пайшлі на хітрасць: знялі аблогу, каля сцен горада пакінулі драўлянага каня, куды схаваліся воіны з *Адысеем*. Нягледзячы на перасцярогу жраца *Лаакоана* («Баюся данайцаў, нават якія прыносяць дары»), траянцы перацягнулі каня ў горад. Ноччу Д. выйшлі з каня, адчынілі гар. вароты, упусцілі свае войскі і ўзялі Трою.

ДА́НАКІЛЬ, тэктанічная ўпадзіна ва Усх. Афрыцы; гл. *Афар*.

ДАНА́НГ (Đa Nẵng), горад у цэнтр. ч. В'етнама. Адм. ц. правінцыі Куангнам-Дананг. Каля 450 тыс. ж. (1995). Буйны порт у бухце Дананг Паўднёва-Кітайскага м., чыг. станцыя, вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: металаапр., гумавая, хім., буд. матэрыялаў, баваўняная, харчовая. Музей. У час вайны ЗША у В'етнаме (1964—1973) у Д. размяшчалася буйная амер. база.

ДАНАТЭ́ЛА (Donatello; сапр. Данато ды Нікала ды Бета Бардзі; Donato di Niccolò di Betto Bardi; каля 1386, г. Фларэнцыя, Італія — 13.12.1466), італьянскі скульптар эпохі ранняга *Адраджэння*. У 1404—07 вучыўся ў майстэрні Л.*Гіберці*. Працаваў пераважна ў Фларэнцыі, а таксама ў Сіене, Рыме, Падуі і інш. Адным з першых у Італіі творча выкарыстаў вопыт ант. пластыкі і прыйшоў да стварэння класічных формаў і відаў рэнесансавай скульптуры — новага тыпу статуі і скульпт. групы, насценнага надмагілля, манумент. коннага помніка, жывапіснага рэльефу. У яго творчасці ўвасобіліся ўласцівыя мастацтву Адраджэння пошукі новых выразных сродкаў, цікавасць да рэальнасці з усёй яе разнастайнасцю, імкненне да ўзвышанага абагульнення і гераічнай ідэалізацыі. Раннія творы Д. вызначаюцца гатычнай скаванасцю формаў, больш познія — яснай тэктонікай пластычных мас, сілай і спакойнай веліччу (статуя св. Марка для фасада царквы Арсанмікеле ў Фларэнцыі, 1411—13). Рэльефы адметныя вял. глыбінёй прасторы («Баляванне Ірада» на бронзавай купелі сіенскага баптыстэрыя, 1423—27; рэльефы Старой сакрысціі царквы Сан-Ларэнца ў Фларэн-

Данатэла. Давід. Бронза. 1430-я г.

цыі, 1434—43). Да найб. вядомых яго твораў належаць таксама алтар «Дабравешчанне» (т.зв. алтар Кавальканці, каля 1428—33, царква Санта-Крочэ, Фла-

рэнцыя), кафедра для пеўчых фларэнційскага сабора (1433—39), статуя «Давід» (1430-я г.) — першая выява аголенага цела ў статуарнай пластыцы Адраджэння. У Падуі стварыў першы свецкі манумент — конны помнік кандацьеру Гатамелату (1447—53) і вял. скульптурны алтар для царквы Сан-Антоніо (1446—50), упрыгожаны рэльефнымі сцэнамі. Познія творы Д. абвострана экспрэсіўныя, пазначаныя рысамі духоўнага надлому (група «Юдзіф і Алаферн», каля 1456—57, пл. Сіньёрыі; рэльефы кафедраў царквы Сан-Ларэнца, 1460-я г., усе ў Фларэнцыі).

ДАНА́Я, у старажытнагрэчаскай міфалогіі дачка аргоскага цара Акрысія, якому прадказалі смерць ад рукі ўнука. Акрысій зняволіў прыгажуню Д. ў падзямелле, куды ніхто не мог увайсці. Аднак *Зеўс* трапіў да Д. ў выглядзе залатога дажджу і яна нарадзіла *Персея*. Паводле загаду бацькі Д. з сынам скінулі ў мора ў абабітай цвікамі скрыні. Іх выратаваў Дыктыс, рыбак з в-ва Серыфос. Пазней Д. з сынам вярнуліся на радзіму, дзе Персей незнарок забіў дзеда кінутым дыскам. Вобраз Д. шырока адлюстраваны ў выяўл. мастацтве (творы вазапісу, пампейскія фрэскі, карціны Л.Лота, А.Карэджа, Рэмбранта, Тыцыяна і інш.).

ДАНБА́С, гл. *Данецкі вугальны басейн.*

ДАНБУРЫ́Т (ад назвы месца першай знаходкі ў Данберы, штат Канектыкут, ЗША), мінерал падкласа борасілікатаў, борасілікат кальцыю, $Ca[B_2Si_2O_8]$. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Крышталі прызматычныя, зярністыя агрэгаты. Бясколерны, шэра-белы, буры. Бляск шкляны. Цв. 7—7,5. Шчыльн. 3 г/см^3. Буйныя намнажэнні ў скарнах, пашыраны ў мармурах, нізкатэмпературных жылах з кальцытам і кварцам. Выкарыстоўваецца як вырабны камень і борная руда. *У.Я.Бардон.*

ДАНГРЭ́К, куэставы ўступ плато Карат, пераважна ў Тайландзе (уздоўж мяжы з Кампучыяй і Лаосам). Даўж. каля 300 км. Выш. да 761 м. Складзены пераважна з пясчанікаў. Паўн. схілы спадзістыя, паўднёвыя — стромкія, моцна расчлянёныя. Клімат субэкватарыяльны. Трапічныя лістападныя лясы, саванны. У зах. частцы Д. нац. парк Кхаўяй.

ДАНГ ТХАЙ ШОН (Dang Thai Son; н. 1958), в'етнамскі піяніст. Нар. арт. В'етнама (1984). Музыцы вучыўся ў маці, вядомай піяністкі, потым у Маскоўскай кансерваторыі. Гастраліруе. Вытанчанасць і філіграннасць выканальніцкай манеры, «адэкватнасць» трактоўкі (асабліва твораў Ф.Шапэна) вылучылі яго як аднаго з лепшых піяністаў свету. Лаўрэат 1-й прэміі Міжнар. конкурсу піяністаў імя Ф.Шапэна (Варшава, 1980).

ДА́НДЫ (Dundee), горад у Вялікабрытаніі, на У Шатландыі. Адм. ц. раёна Тэйсайд. Каля 200 тыс. ж. (1994). Порт у зал. Ферт-оф-Тэй Паўн. м. Прам-сць: эл.-тэхн., нафтаперапр., хім., электронная, паліграф., тэкст., харч.; джутавыя ф-кі, вытв-сць канторскага абсталявання, гадзіннікаў. Ун-т. Арх. помнікі 15—18 ст.

ДАНЕ́ЗІ (Donesi) Алесандра, італьян. спявак («сапраніст») і капельмайстар 18 ст. Працаваў у прыдворным т-ры К.С.Радзівіла Пане Каханку ў Нясвіжы (у 1776 і 1784—85). У 1776—78 капельмайстар прыдворнага т-ра гетмана М.К.Агінскага ў Слоніме.

ДАНЕЛА́ЙЦІС (Donelaitis) Крысціёнас (1.1.1714, в. Лаздзінеляй, Усх. Прусія, цяпер Калінінградская вобл., Расія — 8.2.1780), літоўскі паэт, заснавальнік жанру байкі ў літ. л-ры. Скончыў Кёнігсбергскі ун-т (1740). З 1743 святар лютэранскага прыхода. Найб. значны твор — паэма «Поры года» (1765—75, апубл. 1818; перакладзены на многія мовы свету). У ёй шматгранна і рэалістычна паказаў працу, побыт, нар. звычаі, маляўнічую прыроду Літвы, раскрыў сац. супярэчнасці, стварыў яркія самабытныя характары. У яго байках (захавалася 6, апубл. ў 1824) крытыка чалавечых заган, пратэст супраць сац. і нац. прыгнёту. На бел. мову асобныя творы Д. пераклаў А.Зарыцкі.

Тв.: Бел. пер. — Чатыры пары года. 2 выд. Мн., 1983; Рус. пер. — Времена года: Басни. Л., 1960.

Літ.: Довейка К. Кристионас Донелайтис: Пер. с лит. Вильнюс, 1963.

ДАНЕ́ЛІЯ Георгій Мікалаевіч (н. 25.8.1930, Тбілісі), расійскі і грузінскі кінарэжысёр. Нар. арт. СССР (1989). Скончыў Маск. архітэктурны ін-т (1955), Вышэйшыя рэжысёрскія курсы (1959). З 1960 на «Масфільме». Дэбютаваў фільмам «Сярожа» (1960, разам з І.Таланкіным). Здымае псіхал. драмы («Шлях да прычала», 1962), лірычныя («Я крочу па Маскве», 1964; «Міміно», 1970, Дзярж. прэмія СССР 1978), сатыр. («Трыццаць тры», 1966), фантаст. камедыі («Кін-дза-дза», 1987) і трагікамедыі («Не бядуй», 1969; «Афоня», 1975; «Асенні марафон», 1979, Дзярж. прэмія Расіі 1981; «Слёзы капалі», 1983; «Пашпарт», 1990), для якіх характэрны ўвага да сац. прыроды з'яў і ўчынкаў, спачувальная інтанацыя ў адносінах да герояў.

ДАНЕ́ЛІЯ Леанід Пятровіч (н. 27.3.1946, г. Брэст), бел. мастак. Сын П.А.*Данелія*. Вучыўся ў Мінскім маст.-пед. вучылішчы (1963—65), скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). Працуе ў галіне маст. праектавання, у розных жанрах выяўл. мастацтва. Аўтар праектаў, кіраўнік і выканаўца маст. афармлення інтэр'ераў дома адпачынку «Белая Русь» на воз. Нарач (1987—90), дзіцячага сада ф-кі «Элема» ў Мінску (1993, дэкар. пано, вітраж), гасцінічнага комплексу саўгаса «Заказельскі» Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. (1995; дэкар.-манум. жывапіс, з Дз.Глівай; вітраж, люстры), кампазіцыі «Стары горад» (1996) і інш. Ускладненая кампазіцыя і насычанасць колеравай гамы надае яго пейзажам рамант.-філас. гучанне: «Бабіна лета на Прыпяці» (1980), «Ліпеньскія навальніцы» (1984), «Возера Нарач. Ружовы вечар», «Цішыня. Дзіва над Лотвай» (абедзве 1990-я г.). Сярод тэматычных карцін «Чаканне» (1983), «Пачатак. Дарогай волі» (1989), «Вераніка» (1990) і інш. *Г.А.Фатыхава.*

ДАНЕ́ЛІЯ Пётр Аляксандравіч (н. 23.1.1920, г. Махачкала, Дагестан), бел. жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1995). Вучыўся ў Маск. вучылішчы памяці 1905 г. (1938—39). Працуе ў розных відах выяўл. мастацтва. Яго пейзажы вылучаюцца эмацыянальным успрыманнем прыроды, рамант. прыў-

Даная. Мастак Рэмбрант. 1636.

знятасцю: «Плывуць аблокі» (1957), «Дзень» (1965), «Беларуская мелодыя» (1972), «Восеньскія карункі» (1978), «Пачуццё сустрэчы» (1982), «Абуджэнне» (1988), «Дзень, які сыходзіць» (1990), «Палеская ўсмешка» (1996) і інш. Выканаў манум. размалёўкі для палацаў культуры ў Пінску — «Мастацтва акрыляе» (1976) і ў в. Клейнікі (Брэсцкая вобл.) — «Мірная Брэстчына» (1984), для адм. будынка Брэсцкага хім. камбіната — «Палеская песня» (1980). Аўтар памятных медалёў да 20-годдзя абароны Брэсцкай крэпасці (1961), 950-годдзя Брэста (1969) і інш., помніка-бюста дзеяча рэв. руху ў Зах. Беларусі С.Я.Багданчуку (1970) у пас. Мухавец Брэсцкай вобл. Іл. гл. таксама ў арт. *Багданчук С.Я.* *Г.А.Фатыхава.*

ДАНЕ́Ц, гарадзішча 8 — пач. 10 ст. роменскай культуры каля г.п. Пакацілаўка пад г. Харкаў (Украіна), на правым беразе р. Уды. У 11—13 ст. стараж. ўсх.-слав. горад на памежжы Кіеўскай Русі. Пад 1185 упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе. Археал. даследаваннямі выяўлена, што ў 12 ст. Д. меў умацаваны дзядзінец, пасад з жытламі рамеснікаў. Сярод знаходак вырабы з жалеза, шкляныя бранзалеты, шыферныя прасліцы, кальчугі, рэчы матэрыяльнай культуры полаўцаў. Пасля мангола-татарскіх набегаў у 13 ст. Д. заняпаў.

Л.Данелія. Вераніка. 1990.

П.Данелія. Пачуццё сустрэчы. 1982.

ДАНЕ́ЦК, горад на Украіне, цэнтр Данецкай вобл. Засн. ў 1869 як шахцёрскі пасёлак Юзаўка, у 1924—61 Сталіна. 1,2 млн. ж. (1995). Чыг. вузел. Цэнтр вугальнай прам-сці. Чорная і каляровая металургія, машынабудаванне і металаапрацоўка (вытв-сць горнашахтавага і для харч. прам-сці абсталявання, горнавыратавальнай апаратуры, кабелю, быт. тэхнікі — халадзільнікаў, веласіпедаў і інш.), коксахім., хім. (хім. рэактывы, пластмасы, гумава-тэхн. вырабы, фарбы і інш.), лёгкая (баваўняная), харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. Данецкі навук. цэнтр АН Украіны. 6 ВНУ, у т.л. ун-т. 3 т-ры. Краязнаўчы і маст. музеі.

ДАНЕ́ЦКАЯ ВО́БЛАСЦЬ, на ПдУ Украіны. Утворана 2.7.1932. Пл. 26,5 тыс. км². Нас. 5,2 млн. чал. (1996), гарадскога 90%. Цэнтр — г. *Данецк*. Найб. гарады: *Марыупаль*, Макееўка, Горлаўка, Краматорск, Славянск, Канстанцінаўка, Янакіева.

Прырода. Паверхня пераважна раўнінная. Большая ч. тэр. — Данецкі кряж (выш. да 240 м) і Прыазоўскае ўзв., на ПнЗ — Прыдняпроўская нізіна. Карысныя выкапні: каменны вугаль (гл. *Данецкі вугальны басейн*), каменная соль, ртутныя руды, вогнетрывалыя гліны, даламіты, флюсавыя і буд. вапнякі, мергель, мел, кварцавыя пяскі. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -5 °С да -8 °С, ліп. 21—23 °С. Гадавая колькасць ападкаў каля 500 мм. Гал. рэкі: Северскі Данец, Воўчая, Самара, Кальміус, Крынка, Кальчык. Вобласць размешчана ў межах стэпавай зоны. Глебы пераважна чарназёмныя. Пад лесам і лесапасадкамі каля 6% тэр. (дуб, ясень, клён, ліпа). Запаведнік Хамутоўскі стэп.

Гаспадарка. Буйны раён вугальнай прам-сці (шахты ў Данецку, Макееўцы, Горлаўцы, Янакіева, Шахцёрску, Вуглегорску і інш.), здабыча каменнай солі (Славянск, Арцёмаўск), руд ртуці. Развіты чорная (чугун, сталь, пракат, стальныя трубы і інш.) і каляровая (цынк, ртуць) металургія, коксахім., хім. (мінер. ўгнаенні, кіслоты, сода, сінт. смолы, пластмасы і інш.) прам-сць, цяжкае машынабудаванне (горнашахтавае і металургічнае абсталяванне, чыг. вагоны, станкі, прэсы). Вытв-сць буд. матэрыялаў (цэмент, шыфер, вогнетрывалыя матэрыялы і інш.), лёгкая (тэкст., абутковая, швейная), харч. (рыбныя і агароднінныя кансервы, шампанскія віны, кухонная соль) прам-сць. ДРЭС: Вуглярская, Старабешаўская, Славянская, Курахоўская, Міронаўская і інш. Пасевы пшаніцы, ячменю, кукурузы. Вырошчванне соі, сланечніка, кармавых культур, агародніны. Пладаводства. Вінаградарства. Малочная і малочна-мясная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля, авечкагадоўля. Буйныя масівы арашальных зямель. У вобласці самая густая чыг. сетка на Украіне; праходзяць чыгункі Данецк—Харкаў, Ясінаватая—Крывы Рог; аўтадарогі Харкаў—Растоў-на-Доне, Бярдзянск—Марыупаль—Таганрог, Данецк—Марыупаль. Марскі порт Марыупаль. Курорты: Славянск, Славянагорск, Марыупаль. *С.І.Сідор.*

Каля 60 тыс. км² (выцягнуты на 650 км у шыротным напрамку, пры макс. шыр. 200 км). Ахоплівае слабаўзвышаную стэпавую раўніну паміж р. Северскі Данец і Азоўскім м. У цэнтр. ч. басейна размешчаны Данецкі кряж. Данбас складзены пераважна з асадкавых парод палеазою, мезазою і кайназою, якія залягаюць на крышт. породах дакембрыйскага фундамента. Пласты і праслоі вуглёў характэрны для ўсяго разрэзу каменнавугальных адкладаў. Агульныя запасы вугалю да глыб. 1800 м — 140,8 млрд. т.

Звесткі пра каменны вугаль у Данбасе вядомы з канца 16 — пач. 17 ст. Сістэматычныя даследаванні з 1820-х г., прамысл. асваенне з канца 19 ст. Сярэдняя магутнасць рабочых пластоў 0,6—1,2 м. Колькасць пластоў у вугляноснай тоўшчы да 300. Вуглі камен-

ныя (антрацыты, газавыя, каксавальныя, бедныя). Цеплыня згарання 21,2—26,1 МДж/кг. Здабыча вядзецца на глыб. 400—800 м, некат. шахты маюць глыб. 1 км і больш. Асн. цэнтры здабычы — гарады Данецк, Макееўка, Горлаўка, Лісічанск, Краматорск, Шахты, Паўлаград і інш. *У.Я.Бардон.*

ДАНЕ́ЦКІ КРАЖ, узвышша на Пд Усх.-Еўрапейскай раўніны, на Украіне і ў Расіі. Распасціраецца з ПнЗ на ПдУ на 370 км. Шыр. 160 км. Выш. да 367 м (г. Магіла-Мячэтная). Складзены пераважна з пясчанікаў, вапнякоў і сланцаў, з якімі звязаны радовішчы каменнага вугалю (гл. *Данецкі вугальны басейн*), поліметал. руд, будматэрыялаў, хім. сыравіны. Для рэльефу характэрна спалучэнне хвалістых міжрэччаў і глыбока ўрэзаных (да 150 м) рачных далін. Ярыстая эрозія, трапляецца карставы рэльеф. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -6 да -8 °С, ліп. 21—22 °С. Ападкаў 400—500 мм за год. Захаваліся ўчасткі шыракалістых лясоў (дуб, ясень, клён) і стэпаў.



Данжон.

ДАНЖО́Н (франц. donjon), галоўная шмат'ярусная вежа феад. замка, якая служыла месцам апошняй абароны і сховішчам пры нападзе ворага. Адначасова была назіральным і камандным пунктам у часы ваен. дзеянняў, магла выконваць функцыі аўтаномнай цытадэлі, дзе захоўваўся запас правіянту, ваен. рыштунку. Д. ў Еўропе будавалі ў 9—10 ст., пазней вядомы ўсюды, у т.л. на мусульм. усходзе і ў Закаўказзі. На Беларусі былі пашыраны ў 13—17 ст. Вядомы Д. ў Брэсце, Тураве, Гродне, Навагрудку, Полацку, Шклове і інш. Уцалела вежа-данжон у Камянцы (гл. *Камянецкая вежа*).

Д. размяшчаліся пры гал. браме, непасрэдна каля ўезда ў замак або ў цэнтры ўмацаванняў. У плане маглі быць круглыя, авальныя, прамавугольныя, шматвугольныя. Стральба вялася праз *байніцы*, разлічаныя на кругавую абарону, з баявых балконаў, верхніх баявых пляцовак з-за зубцоў і праз *машыкулі*.

Літ.: Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978. *М.А.Ткачоў.*

ДАНЖУА́ (Denjoy) Арно (5.1.1884, г. Ош, Францыя — 27.1.1974), французскі матэматык. Чл. Парыжскай АН (1942; з 1962 прэзідэнт). Замежны чл. АН СССР (1971). Скончыў Вышэйшую нармальную школу ў Парыжы (1902). Працаваў у розных ун-тах Еўропы. З 1955 ганаровы праф. Парыжскага ф-та навук. Навук. працы па тэорыі функцый, дыферэнцыяльных ураўненнях, тэорыі меры. Даў поўнае рашэнне класічнай задачы пра прымітыўную функцыю, для якога ўвёў новае паняцце інтэграла (інтэграл Д.). Залаты медаль імя М.В.Ламаносава АН СССР (1971).

Данііл Чорны і А.Рублёў. Апосталы Павел і Пётр з групай святых. Фрагмент фрэскі Успенскага сабора ва Уладзіміры. 1408.

ДАНІ́ІЛ ЧО́РНЫ (каля 1360—1430), рускі жывапісец. Разам са сваім сябрам А.*Рублёвым* і інш. майстрамі працаваў ва *Уладзімірскім Успенскім саборы* (1408) і Троіцкім саборы *Троіца-Сергіевай лаўры* ў Загорску (1420-я г.). Яму прыпісваецца ўдзел у выкананні часткі размалёвак і некат. абразоў для гэтых сабораў.

Літ.: Грабарь И.Э. О древнерусском искусстве. М., 1966; Лазарев В.Н. Андрей Рублев и его школа. М., 1966.

ДАНІ́ЛА АЛЯКСА́НДРАВІЧ (1261 — сак. 1303), князь *Маскоўскага вялікага княства* (да 1283—1303). Родапачынальнік маск. князёў. Сын *Аляксандра Неўскага* і полацкай князёўны Аляксандры Брачыслаўны. З 1280-х г. удзельнічаў у барацьбе за права княжыць ва Уладзіміры і Ноўгарадзе. У 1300 далучыў да сваіх уладанняў Каломну і шэраг валасцей, у 1302 — Пераяслаў-Залескі, што дало пачатак росту тэр. Маск. княства. Пасля смерці кананізаваны, перапахаваны ў заснаваным ім каля 1298—99 Данілавым манастыры.

ДАНІ́ЛА РАМА́НАВІЧ (1201—64), князь галіцкі і валынскі. Сын *Рамана Мсціславіча*. З 1211 княжыў у Галічы (у 1212 выгнаны), з 1221 — на Валыні. У 1229 завяршыў аб'яднанне валынскіх зямель, у склад якіх былі ўключаны Бярэсце, Кобрын, Камянец, Бельск, Драгічын; яму падпарадкоўваліся таксама тураўскія і пінскія князі. У 1223 удзельнічаў у бітве супраць мангола-татар на р. Калка, разбіў ням. рыцараў у *Драгічынскай бітве 1238*. У 1238 канчаткова авалодаў Галічам, у 1239 — Кіевам. Заснаваў гарады Львоў, Холм (зрабіў яго сталіцай княства), Угровеск і інш. Ваяваў супраць Польшчы і Венгрыі (1245), літ. князёў, прымусіў яцвягаў плаціць даніну. Каб стварыць кааліцыю супраць мангола-татар, у 1254 прыняў ад рымскага папы карону караля галіцкага, каранаваўся ў Драгічыне. У 1259

І.**Данілава**. Кветкавая кампазіцыя. 1996.

вымушаны прызнаць залежнасць ад манголаў. У перыяд яго княжання Галіцка-Валынскае княства дасягнула эканам. і паліт. росквіту, пашырыўся яго ўплыў на бел. землі. *А.П.Грыцкевіч.*

ДАНІ́ЛАВА Аляксандра Юр'еўна (н. 27.3.1927, г. Гадзяч, Украіна), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1970). Скончыла Кіеўскі інж.-буд. ін-т (1951). З 1951 працавала ў Ін-це «Віцебскгрампадзянпраект». Асн. работы ў Віцебску: будынкі прафтэхвучылішча быт. абслугоўвання (1956) і электратэхнікума су-

вязі (1957, у сааўт.), забудова вуліцы Кірава, пл. Перамогі, цэнтр. і паўд. раёнаў (1973), пл. 1000-годдзя горада (1975), мікрараёнаў Юбілейны (1976), Поўдзень-6 (1980) і інш. Адзін з аўтараў генпланаў Полацка і Наваполацка (1964), Віцебска (1966), Оршы (1968).

ДАНІЛАВА Ірына Мікалаеўна (н. 10.9.1951, г. Гомель), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976). Працуе ў тэхніцы габелену. Асн. работы (усе з мужам А.*Дваранінам*): трыпціх «Раніца», «Поўдзень», «Вечар» (1986—87), дыптых «Мой горад», «Маё Палессе» (1988—90) для аэрапорта, «Музыка» (1990—91), «Песня» (1991—93), «Музыка і тэатр» (1994) для муз. і маст.-навук. установы, «Песня пра зубра» (1995) для абл. драм. т-ра — усе ў Гомелі, «Кветкавая кампазіцыя» (1996) і інш. Творчая манера адметная вытанчанасцю кампазіцыі, эмацыянальнай выразнасцю, паэт. светаўспрыманнем. *Т.Ф.Літвінава.*

ДАНІЛАВІЧЫ, вёска ў Веткаўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на ПнЗ ад Веткі, 25 км ад Гомеля, 13 км ад чыг. ст. Касцюкоўка. 367 ж., 152 двары (1997). Пач. школа, клуб, аддз. сувязі. Царква.

ДАНІЛАЎ Аляксандр Мікалаевіч (н. 14.5.1955, г. Віцебск), бел. сацыёлаг. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1996). Д-р сацыялаг. н. (1994), праф. (1997). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1980). З 1978 працаваў у ЦК ЛКСМБ, СМ Беларусі. З 1994 у Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: заг. сектара, нам. нач. Гал. ўпраўлення грамадска-паліт. інфармацыі. Адначасова з 1991 выкладае ў БДУ. Нам. акадэміка-сакратара Аддзялення гуманіт. навук і мастацтваў Нац. АН Беларусі, гал. рэдактар час. «Социология». Даследуе асн. кірункі і перспектывы сістэмнай трансфармацыі сучаснага грамадства, праблемы каштоўнасных арыентацый моладзі, метадыкі аператыўнага вывучэння грамадскай думкі. Адзін з аўтараў навуч. дапаможнікаў па сацыялогіі, методыцы сацыялагічных даследаванняў, гісторыі сацыялогіі.

Тв.: Семья и молодежь: Профилактика отклоняющегося поведения. Мн., 1989 (у сааўт.); Молодежь и демократизация советского общества. Мн., 1990 (у сааўт.); Переходный процесс и молодежь. Мн., 1993; Переходное общество: Пробл. системной трансформации. Мн., 1997.

ДАНІЛАЎ Аляксей Ільіч (19.1.1923, в. Кашчева Смаленскай вобл., Расія — 30.6.1944), удзельнік вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў у Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў палкавую школу танкістаў. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1944. Вызначыўся 30.6.1944 пры вызваленні Барысава: экіпаж танка — камандзір П.М.*Рак*, механік-вадзіцель А.А.*Пятраеў*, радыст Д. — прарваўся ў заняты ворагам горад, 17 гадзін вёў бой, вызваліў 200 чал. ваеннапалонных. Экіпаж згарэў у танку. У Барысаве экіпажу танка пастаўлены помнік.

ДАНІЛАЎ Іван Пятровіч (н. 27.9.1924, в. Ляжыткавічы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне гематалогіі і пералівання крыві. Д-р мед. н., праф. (1972). Акад. Міжнар. акадэміі інфарм. працэсаў і тэхналогій (1995). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1955). У 1964—74 дырэктар Бел. НДІ гематалогіі і пералівання крыві. З 1990 у НДІ радыяцыйнай медыцыны, з 1993

А.М.Данілаў.

А.І.Данілаў.

С.М.Данілаў.

кіраўнік Рэсп. цэнтра гемафіліі. Навук. працы па гематалогіі, пульманалогіі, трансфузіялогіі, праблемах згусальнасці крыві.

Тв.: Трансфузионная терапия в клинике внутренних болезней. Мн., 1975; Хронический бронхит. Мн., 1989 (разам з А.Э.Макарэвічам).

ДАНІЛАЎ Павел Аўрамавіч (13.11.1897, в. Красноўка Крупскага р-на Мінскай вобл. — 11.2.1975), бел. рэжысёр, драматург. Засл. дз. маст. Беларусі (1961). Скончыў Ленінградскі ін-т сцэн. мастацтваў (1926). У 1930—36 працаваў у БДТ-1 (Бел. т-р імя Я.Купалы), адначасова заг. (1932—33), маст. кіраўнік (1935—36), выкладчык (1936—38) студый т-ра. Сярод пастановак: «Герой» Я.Рамановіча, «Мядзведзь» А.Чэхава, «Агаціна цялушка» (па сваёй п'есе; усе 1933), «Сімфонія гневу» В.Шашалевіча (1935, разам з Л.Літвінавым). Адыграў значную ролю ў дзейнасці калг.-саўгасных т-раў Беларусі. Маст. кіраўнік т-раў: Барысаўскага (1936—38) і Заслаўскага (1938—39) калг.-саўгасных, Пінскага абл. драм. (1939—41). Найб. значныя пастаноўкі: «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы, «Сваты» І.Гурскага, «Праўда добра, а шчасце лепш» А.Астроўскага, «Слуга двух гаспадароў» К.Гальдоні. У 1947—63 гал. рэжысёр Бел. радыё. Аўтар п'ес «Лявоніха» (1960), «Дзівосы на калёсах» (1961) і інш., інсцэніровак для радыё.

ДАНІЛАЎ Сцяпан Мікалаевіч (7.1.1889, г. Віцебск — 4.2.1978), савецкі хімік-арганік. Чл.-кар. АН СССР (1943), праф. (1930). Скончыў Пецярб. ун-т (1914), у ім і выкладаў. З 1949 у Ін-це высокамалекулярных рэчываў АН СССР. Навук. працы па тэарэт. арган. хіміі і хім. тэхналогіі прыродных палімераў. Адкрыў альдэгідакетонную ізамерызацыю (перагрупоўка Д.), ажыццявіў рэакцыю ізамерызацыі гідраксіальдэгідаў у гідраксікетоны і карбонавыя к-ты. Распрацаваў новыя спосабы атрымання эфіраў цэлюлозы.

Літ.: С.Н.Данилов. М., 1971.

ДАНІЛАЎ Сямён Пятровіч (20.10.1917, Мытахскі наслег Горнага р-на, Якуція — 27.11.1973), якуцкі паэт. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1957). Друкаваўся з 1937. Першая кніга «Апавяданні» (1945). У паэт. зб-ках «Мая радзіма» (1949), «Мірны горад» (1958), «Белы конь Манчары» (1969, Дзярж. прэмія Расіі імя М.Горкага 1971), «Гучанне тайгі» (1972), «Галасы зямлі» (1977), «Мая Палярная зорка» (выд. 1980) і інш. — жыццё, праца, суровая і непаўторная прырода Поўначы, лёс чалавека самабытнага якуцкага краю. Яго паэзіі ўласцівы маштабнасць і глыбіня думкі, лірызм і публіцыстычнасць, паглыблены псіхалагізм. Аўтар літ.-крытычных артыкулаў, кнігі перакладаў «Сябры-паэты» (1963). На бел. мову творы Д. пераклаў У.Правасуд.

Тв.: Рус. пер. — Избр. Т. 1—2. М., 1977.

Літ.: Литвинов В.М. Семен Данилов. М., 1971.

ДАНІЛАЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА ГЛІН, у Ваўкавыскім і Мастоўскім р-нах Гродзенскай вобл., каля в. Данілаўка. Пластавы паклад звязаны з марэннымі адкладамі сожскага зледзянення. Гліны шэрыя, карычневыя, шчыльныя, вязкія, з рэдкімі ўключэннямі жвіру і дробнай галькі. Разведаныя запасы 14,9 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,4—19,1 м, ускрышы (пяскі, супескі) да 8,6 м. Гліны прыдатныя на вытв-сць цэменту. Радовішча распрацоўваецца АП «*Ваўкавыскцэментнашыфер*». *А.П.Шчураў.*

ДАНІЛЕ́ВІЧ Васіль Яўхімавіч (1872, г. Курск, Расія — 16.11.1936), украінскі гісторык, археолаг. Скончыў Кіеўскі ун-т. З 1902 праф. Харкаўскага, з 1907 Кіеўскага ун-таў. Працаваў у археал. экспедыцыях на Полаччыне, Падзвінні, даследаваў стаянку каменнага веку каля в. Кісцяні Рагачоўскага р-на. У працах «Нарыс гісторыі Полацкай зямлі да канца XIV ст.» (1896) і «Шляхі зносін Полацкай зямлі да канца XIV ст.» (1898) абгрунтаваў правамернасць назвы «Полацкая зямля», на матэрыялах археал. даследаванняў паказаў яе гіст. ролю, ваен. і эканам. стабільнасць. Аўтар прац па нумізматыцы, сфрагістыцы, фальклоры, этнаграфіі. *Г.А.Каханоўскі.*

ДАНІЛЕ́НКА Міхась (Міхаіл Пятровіч; н. 28.10.1922, в. Ястрабка Лоеўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1952). Настаўнічаў. У 1953—82 у рэдакцыі «Гомельскай праўды». Друкуецца з 1940. Большасць апавяданняў прысвяціў падзеям вайны, жыццю вёскі і школы, працы настаўнікаў. Героі яго твораў — людзі высакародныя, верныя свайму дому, зямлі, непрымірымыя да праяў несумленнасці і фальшу (аповесці «Наш дом», 1971, «Апанаска Лугавы», 1972, і інш.). Для дзяцей выдаў кнігі «Вернасць слову» (1956), «Зачараваны гарлачык» (1961), «На вуліцы Сонечнай» (1963), «Ключы бабулі Зімы» (1986). Піша вершы, нарысы.

Тв.: Мая песня. Мн., 1952; Майская навальніца. Мн., 1959; Навасёлле. Мн., 1964; Запаветны акіян. Мн., 1972; Маці Мар'я. Мн., 1976; Журлівіца. Мн., 1980; Родная зямля. Мн., 1982.

ДАНІЛЕ́ЎСКІ Аляксандр Якаўлевіч (22.12.1838, г. Харкаў, Украіна — 18.7.1923), расійскі біяхімік, заснавальнік рус. навук. школы біяхімікаў. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1898). Брат В.Я.*Данілеўскага*. Скончыў Харкаўскі ун-т (1860). З 1863 праф. Казанскага, з 1885 Харкаўскага ун-таў, з 1892 у Ваенна-мед. акадэміі ў Пецярбургу (у 1906—10 рэктар). Навук. працы па хім. будове і абмене бялкоў, энзімалогіі, біяхіміі харчавання. Распрацаваў метад выбіральнай адсорбцыі, прапанаваў навук. класіфікацыю бялкоў мозгу, «тэорыю элементарных радоў». Выдаў «Фізіялагічны зборнік» (т. 1—2, 1888—91, разам з братам В.Я.*Данілеўскім*).

ДАНІЛЕ́ЎСКІ Васіль Якаўлевіч (25.1.1852, г. Харкаў, Украіна — 25.2.1939), украінскі фізіёлаг і гістолаг. Акад. АН Украіны (1926). Брат А.Я.*Данілеўскага*. Скончыў Харкаўскі ун-т (1874), праф. у ім (у 1883—1909 і 1917—21). З 1910 дырэктар Харкаўскага жаночага мед. ін-та, з 1921 у Харкаўскім мед. ін-це, у 1927 арганізаваў і ўзначаліў Украінскі НДІ эндакрыналогіі і арганатэрапіі. Навук. працы па агульнай і параўнальнай фізіялогіі, фізіялогіі нерв. сістэмы, электрафізіялогіі, эндакрыналогіі і пратысталогіі. Выявіў цэнтр у кары галаўнога мозга, што рэгулюе дзейнасць сэрца. Займаўся праблемамі электраэнцэфалаграфіі, фізіял. вывучэння гіпнозу ў чалавека і жывёл.

ДАНІЛЕ́ЎСКІ Мікалай Якаўлевіч (10.12.1822, Арлоўская губ. — 19.11.1885), расійскі прыродазнавец, адзін з тэарэтыкаў і ідэолагаў *славянафільства* і *панславізму*. Член Рус. геагр. т-ва. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1847). За ўдзел у руху *петрашэўцаў* у 1849—52 праследаваўся ўладамі. Удзельнік (1853—57) і кіраўнік (1858—71) шэрагу навук. экспедыцый па даследаванні стану рыбалоўства ў Расіі. Распрацаваў канцэпцыю культ.-гіст. тыпаў (цывілізацый), у якой абгрунтаваў курс Расіі на барацьбу супраць Захаду за ўплыў на слав. і інш. народы Еўропы, з пазіцый *тэлеалогіі* крытыкаваў эвалюц. тэорыю Ч.*Дарвіна*. Аўтар паліт. і эканам. артыкулаў.

Тв.: Россия и Европа. М., 1991.

Літ.: Захарова А.А. Россия в философско-исторической концепции Н.Я.Данилевского. Томск, 1986; Авдеева Л.Р. Русские мыслители: Ап.Л.Григорьев, Н.Я.Данилевский, Н.Н.Страхов: Филос. культурология второй половины XIX в. М., 1992.

ДАНІЛЕ́ЎСКІ Рыгор Пятровіч (26.4.1829, с. Данілаўка Харкаўскай вобл., Украіна — 18.12.1890), рускі і ўкр. пісьменнік. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1850). У 1869—90 рэдактар газ. «Правительственный вестник». Аўтар раманаў пра барацьбу сялян супраць прыгону «Беглыя ў Наваросіі» (1862), «Воля» («Беглыя вярнуліся», 1863, пад псеўд. А.Скаўронскі). З канца 1870-х г. пісаў гіст. раманы: «Міровіч» (1879),

І.М.**Даніловіч**. Партрэт работы Р.Жукоўскага. 1846.

«Княжна Тараканава» (1883), «Спаленая Масква» (1886), у якіх праўдзіва адлюстраваў побыт эпохі, стварыў займальныя сюжэты, што прынесла творам папулярнасць.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—10. М., 1995.

ДАНІЛІ́ЦКІ Антон Пятровіч (н. 1.1.1922, в. Бобрык Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Бабруйскі тэхнікум мех. апрацоўкі дрэва (1940), Ваен. акадэмію бранятанк. войск (1954). У Чырв. Арміі з 1940. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941. Удзельнік вызвалення Украіны, Польшчы, Берлінскай і Пражскай аперацый. Камандзір танка Д. вызначыўся ў ліп.—жн. 1944 у Львоўска-Сандамірскай аперацыі. Да 1972 у Сав Арміі.

ДАНІЛО́ВІЧ Алена Мікалаеўна (10.5.1906, г. Разань, Расія — 8.11.1957), руская і бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1955). З 1923 працавала ў т-рах Расіі. З 1934 у Бел. трэцім дзярж. т-ры (БДТ-3), з 1937 у Мазырскім т-ры рабочай і калг. моладзі і створаным на яго базе ў 1938 Палескім абл. драм. т-ры. У 1945—46 дырэктар Брэсцкага абл. драм. т-ра імя ЛКСМБ. З 1946 актрыса Палескага і створаных на яго аснове Пінскага і Магілёўскага (1954) абл. драм. т-раў. Характарная актрыса.

Сярод роляў: Мальвіна («Несцерка» В.Вольскага), пані Яндрыхоўская («Партызаны» К.Крапівы), Марына Сямёнаўна («Алазанская даліна» К.Губарэвіча і І.Дорскага), Франя («Калі зацвітаюць сады» В.Палескага), Васа («Васа Жалязнова» М.Горкага), Гурмыжская («Лес» А.Астроўскага), Ганна Андрэеўна («Рэвізор» М.Гогаля).

ДАНІЛО́ВІЧ Ігнат Мікалаевіч (10.8.1787, в. Грынявічы Бельскага пав. Падляшскага ваяводства, Польшча — 12.7.1843), гісторык, правазнавец, адзін з першых даследчыкаў летапісных і заканадаўчых помнікаў Беларусі і Літвы. Праф. (1822). Скончыў Віленскі ун-т (1812), дзе ў 1814—24 выкладаў права. Пасля раскрыцця т-ва *філаматаў* звольнены з працы. У 1825—29 праф. Харкаўскага ун-та; у 1830—35 працаваў у Пецярбургу ў камісіі М.М.Спяранскага па падрыхтоўцы законаў для зах. губерняў. У 1835—42 выкладаў права ў Кіеўскім і Маскоўскім ун-тах. Займаўся зборам, вывучэннем і публікацыяй пісьмовых крыніц па гісторыі Беларусі і Літвы. Упершыню апісаў усе рукапісныя і друкаваныя экз. Статутаў ВКЛ, падрыхтаваў першае навук. выданне Статута ВКЛ 1529 (выд. у 1841), апублікаваў бел.-літ. летапіс 1446 паводле Супрасльскага рукапісу. Апісаў, пераказаў змест і часткова апублікаваў каля 2500 розных пісьмовых крыніц па гісторыі Беларусі і Літвы. Працы Д. сталі пачаткам навук. даследавання бел.-літ. летапісання. *В.А.Чамярыцкі.*

ДАНІЛО́ВІЧ Міхаіл Восіпавіч (1853, г.п. Асвея Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. — ?), удзельнік рэв. руху ў Расіі і Польшчы. У сярэдзіне 1870-х г. вучыўся ў Пецярб. медыка-хірург. акадэміі, уваходзіў у народніцкія гурткі. У 1878 перавёўся на мед. ф-т Варшаўскага ун-та. Уступіў у Варшаўскую сацыяльна-рэв. арг-цыю, вёў прапаганду сярод студэнтаў і рабочых. Падтрымліваў кантакты з рэвалюцыянерамі Віцебска, Вільні, Полацка, Пецярбурга. Перапісваўся з дзеячамі польскага сацыяліст. руху В.Урублеўскім, В.Свянціцкім, І.Гласко. У 1878 арыштаваны, зняволены ў Варшаўскую цытадэль. У 1880 сасланы на 5 гадоў ва Усх. Сібір, пасля заканчэння тэрміну ссылкі застаўся ў Сібіры. *В.М.Чарапіца.*

ДАНІЛЬКЕ́ВІЧ Мечыслаў Іванавіч (н. 14.10.1935, в. Міхнаўшчына Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1991), праф. (1993). Скончыў БДУ (1958), там і працаваў. З 1996 у Ін-це электронікі Кашалінскага тэхн. ун-та (Польшча). Навук. працы па магн., эл., мех. уласцівасцях цвёрдых цел. Атрымаў і даследаваў шырокадыяпазонныя дыэлектрычныя спектры ферытаў; прапанаваў метад вызначэння

трываласці крышталёў праз энергію крышт. рашоткі.

Тв.: Диэлектрические свойства оксидных феррошпинелей с различным магнитным разбавлением // Неорганические материалы. 1997. Т. 33, № 3.

ДАНІЛЮ́К Леанід Сямёнавіч (3.5.1919, в. Студзёнка Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 24.9.1986), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1939), Тбіліскае артыл. вучылішча (1941). У Вял. Айч. вайну са жніўня 1941 на Паўн.-Зах., 2-м Укр., 1-м Бел. франтах. Камандзір самаходнага артыл. палка маёр Д. вызначыўся 18.4.1945 пры ўзяцці г. Бернаў у час Берлінскай аперацыі. Да 1955 у Сав. Арміі.

ДАНІЛЮ́К Святлана Піліпаўна (н. 25.3.1939, Кіеў), бел. спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. Беларусі (1971). Нар. арт. СССР (1977). Скончыла Кіеўскую кансерваторыю (1963, клас З.*Гайдай*). Працавала ў Пермскім т-ры оперы і балета. З 1966 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі (у 1973 удасканальвалася ў міланскім т-ры «Ла Скала»), з 1986 салістка Бел. філармоніі. Валодае сакавітым, моцным і адначасова гнуткім рухомым голасам з добра развітым верхнім рэгістрам, што дае ёй магчымасць выконваць і каларатурныя партыі (Разіна ў «Севільскім цырульніку» Дж.Расіні). Віртуозную тэхніку, майстэрства вакалізацыі Д. падпарадкоўвае ўдумлівай, тонкай інтэрпрэтацыі розных па стылі твораў, старанна шліфуе сцэнічны малюнак вобраза. У операх нац. рэпертуару стварыла вобразы Алесі («Алеся» Я.Цікоцкага), Веранікі («Зорка Венера» Ю.Семянякі). Творчая індывідуальнасць найб. яскрава выявілася ў партыях драм. плана: Любаша («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Марына Мнішак, Марфа («Барыс Гадуноў», «Хаваншчына» М.Мусаргскага), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Амнерыс, Азучэна, Эбалі («Аіда», «Трубадур», «Дон Карлас» Дж.Вердзі), Артруда («Лаэнгрын» Р.Вагнера), Сантуца («Сельскі гонар» П.Масканьі). У канцэртных праграмах значную частку складаюць творы бел. кампазітараў; выконвае сольныя партыі ў буйных вак.-сімф. творах. Лаўрэат 3-га Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя Глінкі (1965, 2-я прэмія), дыпламант 3-га Міжнар. конкурсу імя Чайкоўскага (1966).

А.П.Даніліцкі.

Л.С.Данілюк.

С.П.Данілюк.

Літ.: Жураўлёў Дз.М. Святлана Данілюк // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1978. *Т.А.Дубкова.*

ДАНІ́НА, старажытная форма падатку. Першапачаткова натуральныя ці грашовыя паборы, што спаганяліся пераможцамі з заваяваных плямён ці дзяржаў. На Русі вядома з 9 ст., у 11—16 ст. дзярж. падатак і феад. рэнта. У 13—15 ст. Д. ясак збіралася з рус. княстваў на карысць *Залатой Арды*. На Беларусі да канца 15 ст. Д. — асн. форма рэнты. Збіралася натуральнай прадукцыяй (мёд, воск, футра, пазней с.-г. прадукцыя), якая часткова спалучалася з адработачнай і грашовай формамі рэнты.

ДАНІСЕ́ВІЧ Стафан (1836, Магілёўская губ. — 3.12.1913), бел. каталіцкі рэліг. дзеяч. Скончыў Пецярб. каталіцкую духоўную акадэмію са ступенню магістра тэалогіі (1863) і пасвячоны ў святара. Служыў на розных пасадах у Магілёўскай губ. і Смаленску. З 1903 адміністратар Магілёўскай архідыяцэзіі, у 1908 атрымаў ганаровы тытул біскупа клаўдзіяпалітанскага. Быў прыхільнікам выкарыстання бел. мовы ў царк. жыцці. Садзейнічаў выданню «Элементара [буквара] для добрых дзетак каталікоў» (СПб., 1906, лацінкай), для якога напісаў прадмову. Быў цэнзарам кніг на бел. мове (лацінкай) «Кароткі катэхізм» (1907) і «Кароткая гісторыя святая» (1914).

Літ.: Stankiewicz A. Rodnaja mowa ŭ światyniach. Wilnia, 1929. *І.І.Трацяк.*

ДАНІЦЭ́ЦІ (Donizetti) Гаэтана (29.11.1797, г. Бергама, Італія — 8.4.1848), італьянскі кампазітар. У 1815—17 вучыўся ў Балонскім муз. ліцэі. У 1839—40 і пазней працаваў у Парыжы, дзе пастаўлены многія з яго опер, у 1840-я г. таксама ў Аўстрыі (з 1842 аўстр. прыдворны кампазітар). У 1834—39 праф. кансерваторыі ў Неапалі (з 1837 дырэктар). Асн. частку творчай спадчыны Д., майстра стылю

С.Данілюк у ролях Марыны Мнішак (злева) і Сантуцы.

Помнік Г.Даніцэці ў касцёле Санта-Марыя ў Бергама.

бельканта, складаюць усе жанравыя разнавіднасці італьян. оперы (опера-буфа, опера-камік, лірыка-драм. і рамант. оперы, сац.-псіхал. меладрамы і інш.), яны насычаны выразнымі, лёгка запамінальнымі мелодыямі, эфектнымі арыямі, вылучаюцца яркай тэатральнасцю. Сярод найб. папулярных опер «Любоўны напітак» (1832) і «Дон Паскуале» (1843), адзін з лепшых узораў оперы-буфа, адзначаны невычарпальным дасціпным гумарам, жыццярадаснасцю, мяккім лірызмам.

Сярод інш. твораў: оперы «Пётр Вялікі, цар рускі, або Лівонскі цясляр» (1819), «Дон Грэгорыо» (1824), «Ганна Балейн» (1830), «Лукрэцыя Борджа» (1833), «Лючыя ды Ламермур» (1835), «Паліеўкт» (1838), «Марыя ды Роган» (1843), араторыі, кантаты, 16 сімфоній, камерна-інстр., вак. творы.

Літ.: Донати-Петтени Дж. Гаэтано Доницетти: Пер. с итал. Л., 1980.

ДАНІЭ́ЛЬ, жывёла, гл. *Лань*.

ДАНІЭЛЬСО́Н Мікалай Францавіч (26.1.1844, Масква — 3.7.1918), расійскі эканаміст, публіцыст, адзін з тэарэтыкаў ліберальнага *народніцтва*. Скончыў Пецярбургскае камерцыйнае вучылішча (1862). Сябар Г.А.*Лапаціна*. Перапісваўся з К.Марксам і Ф.Энгельсам, забяспечваў іх л-рай і звесткамі па эканоміцы Расіі. У 1870 арыштаваны па справе С.Г.*Нячаева*. Завяршыў (разам з М.М.Любавіным) пачаты Лапаціным пераклад на рус. мову 1-га т. «Капіталу» Маркса (выдадзены ў 1872), пераклаў 2-і (1885) і 3-і (1896) тамы. Гал. праца — «Нарысы нашай парэформеннай гаспадаркі» (1893), у якой спалучаны марксісцкія і народніцкія ідэі.

ДАНІЭЛЯ́Н Айкануш Багдасараўна (15.12.1893, Тбілісі — 19.4.1958), грузінская і армянская спявачка (лірыка-каларатурнае сапрано). Нар. арт. СССР (1939). Скончыла Петраградскую кансерваторыю (1920). З 1922 салістка Грузінскага, у 1933—48 Армянскага т-раў оперы і балета. У 1943—51 выкладала ў Ерэванскай кансерваторыі (праф. з 1949). У рэпертуары выпучаліся партыі з опер арм. кампазітараў — Ануш («Ануш» А.Тыграняна), Алімпія («Аршак II» Т.Чухаджана), а таксама класічных — Марфа («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Антаніда («Іван Сусанін» М.Глінкі), Маргарыта Валуа («Гугеноты» Дж.Меербера), Джыльда, Віялета, Дэздэмона («Рыгалета», «Травіята», «Атэла» Дж.Вердзі). Дзярж. прэмія СССР 1946.

ДА́НІЯ (Danmark), Каралеўства Данія (Kongeriget Danmark), дзяржава ў Зах. Еўропе. Размешчана на п-ве Ютландыя, а-вах Зеландыя, Фюн, Лолан, Фальстэр, Мён, Борнхальм і інш. На Пд мяжуе з Германіяй (даўж. сухапутнай граніцы 68 км). На З абмываецца Паўночным м., на Пн — прал. Скагерак, на У — прал. Катэгат, Эрэсун, Балтыйскім м. Пл. 43,1 тыс. км^2, у т.л. 19,3 тыс. км^2 пл. астравоў. Нас. 5165 тыс. чал. (1993). Дзярж. мова — дацкая. Сталіца — г. Капенгаген. Падзяляецца на 14 амтаў (раёнаў). У склад Д. ўваходзяць *Грэнландыя* і *Фарэрскія астравы*, якія маюць унутр. аўтаномію. Нац. святы — Дзень нараджэння каралевы Маргрэтэ II (16 крас.) і Дзень Канстытуцыі (5 чэрв.).

Дзяржаўны лад. Д. — канстытуцыйная манархія. Дзейнічае канстытуцыя 1953. Кіраўнік дзяржавы — манарх. Заканад. ўлада належыць манарху і аднапалатнаму парламенту — фолькетынгу (179 дэпутатаў), што выбіраецца на 4 гады. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад, які назначае манарх і ўзначальвае прэм'ер-міністр. Урад адказны перад фолькетынгам.

Прырода. Рэльеф пераважна раўнінны са шматлікімі марэннымі ўзгоркамі. Найвыш. пункт г. Аер-Баўнехёй (173 м). Зах. і паўн.-зах. ўзбярэжжа — нізіна з паласой дзюн, якія аддзяляюць шматлікія лагуны ад мора. Усходнія берагі п-ва Ютландыя і в-ва Зеландыя моцна расчлянёныя, месцамі абрывістыя, ёсць шмат бухтаў. Карысныя выкапні: нафта і прыродны газ (у Паўночным м.), торф, буд. матэрыялы і інш. Клімат умераны, марскі, з мяккай няўстойлівай зімой, халаднаватым летам. Сярэдняя т-ра студз. каля 0 °С, ліп. 16 °С. Ападкаў ад 600 мм на У да 800 мм на З. Рэкі невялікія, найб. Гудэна (158 км). Шмат невял. азёр. Пад лесам 10% тэр., пераважаюць бук і дуб. Ёсць саджаныя лясы з елкі, хвоі, піхты і лістоўніцы. На З верасовыя пусткі. Запаведнікі Хеселё, Ворсё і інш.

Герб і сцяг Данii.

Насельніцтва. Датчане складаюць каля 98% насельніцтва. На Пд Ютландыі жыве 40 тыс. немцаў. Ёсць невял. групы выхадцаў з Турцыі, б. Югаславіі, Швецыі, Вялікабрытаніі. Сярод вернікаў пераважаюць лютэране (91%), ёсць прыхільнікі інш. галін пратэстанцтва, каталікі. Сярэдняя шчыльн. 120 чал. на 1 км^2, больш шчыльна заселены У краіны, асабліва в-аў Зеландыя. У гарадах 85% насельніцтва (1993). Больш за 25% насельніцтва краіны жыве ў Капенгагене з прыгарадамі (1,35 млн. ж., 1994). Значныя гарады (тыс. ж., 1993): Орхус — 274,5, Одэнсе — 181,8, Ольбарг — 158,1.

Гісторыя. Засяленне тэр. Д. чалавекам пачалося ў эпоху позняга палеаліту. У

мезаліце тут існавала археал. культура *маглемазэ*. З апошніх стагоддзяў да н.э. на землях сучаснай Д. жылі стараж. *германцы*. Пасля перасялення большасці англаў, саксаў, ютаў на Брыт. а-вы (гл. *Англасаксонскае завяванне*) на тэр. Д. ў 5—6 ст. н.э. з Пд Скандынаўскага п-ва прыбылі германамоўныя даны, вядомыя паводле пісьмовых крыніц прыблізна з 550 (адсюль назва Данія), якія сталі тут пануючым племем. У эпоху *вікінгаў* (канец 8 — сярэдзіна 11 ст.) продкі датчан каланізавалі б.ч. Брытаніі, абклаўшы яе насельніцтва данінай (т.зв. «дацкімі грашыма»), потым стварылі ў вусці Сены герцагства Нармандыя (911). Гэта садзейнічала іх паліт. кансалідацыі і ўтва-

рэнню раннедацкага каралеўства (першым каралём быў Годфрэд, памёр у 810), што ўмацавалася пры Горме Старым (памёр каля 950) і яго сыне Харальдзе Сінязубым (памёр каля 985, пры ім у Д. каля 960 прынята хрысціянства). У эпоху вікінгаў узніклі першыя дацкія гарады, значную ролю ў грамадстве пачалі адыгрываць *бонды*, якія складалі аснову ваенна-марскога апалчэння (ледунга). Пры *Кнудзе I Вялікім* [1018—35] кароткі час існавала англа-дацка-нарв. дзяржава. Пазней пад уладу Д. трапіла герцагства Шлезвіг (гл. *Шлезвіг-Гольштэйн*; з 1460 у асабістай уніі). У 2-й пал. 12 — пач. 13 ст. Д. завявала паўд. і частку ўсх. ўзбярэжжа Балтыйскага м. (пасля бітвы 1227 з немцамі пры Борнхёведзе б.ч. гэтых тэр. страчана). Вайна 1367—70 з *Ганзай* за панаванне на Балтыцы скончылася паражэннем Д. У 1397—1523 пад уладай дацкіх каралёў (Кальмарская унія) аб'яднаны Нарвегія і Швецыя (у 1523 вызваліліся з-пад дацкага панавання). У 2-й пал. 16 ст. Д. дамаглася перавагі на Балтыйскім м. Яна ўдзельнічала ў *Трыццацігадовай вайне 1618—48*. У 17 ст. ў краіне ўстаноўлена абсалютная манархія (1660), з'явіліся першыя мануфактуры. Працяглыя сял. выступленні прывялі да скасавання прыгону (1788—1800). Д. ўдзельнічала (фактычна безвынікова) разам з Расіяй і Саксоніяй у *Паўночнай вайне 1700—21* супраць Швецыі, была адной з дзяржаў-ініцыятараў першага ўзбр. нейтралітэту (1780) у *Вайну за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83*. У выніку нападу англічан на Капенгаген і захопу імі дацкага ВМФ (1807) Д. ўцягнулася ў *напалеонаўскія войны* на баку Францыі. Паводле *Кільскіх мірных дагавораў 1814* яна страціла Нарвегію, в-аў Гельгаланд і інш., аднак захавала пад сваёй уладай нарв. заморскія тэр. — Ісландыю, Грэнландыю, Фарэрскія а-вы. Пасля часовага эканам. застою ў Д. ў 1830—40-я г. пачалася прамысл. рэвалюцыя (у т.л. ў 1847 пабудавана першая чыгунка). Адначасова пад націскам апазіц. ліберальнага руху прынята канстытуцыя 1849, паводле якой устаноўлены рэжым абмежаванай манархіі з 2-палатным парламентам (рыксдагам) і ўрадам, адказным перад каралём. У гэты ж час абвастрылася шлезвіг-гольштэйнская праблема, што выклікала *дацка-прускую вайну 1848—50*. Наступны крызіс узнік у 1863 у сувязі з прыняццем новай дацкай канстытуцыі, прывёў да *дацкай вайны 1864* і адмовы Д. ад прэтэнзій на тэр. герцагстваў. Да ўлады ў краіне прыйшлі кансерватыўныя сілы, якія ў 1866 дамагліся перагляду канстытуцыі 1849: за каралём прызнана права абсалютнага вета і выдання законаў паміж сесіямі парламента, дэпутаты верхняй палаты парламента (ландстынга) сталі выбірацца буйнымі землеўладальнікамі або прызначацца каралём. У 1870 кансерватары ўтварылі кабінет з удзелам правых лібералаў, а іх праціўнікі (левыя лібералы) стварылі аб'яднаную левую партыю (Венстрэ) і разгарнулі паліт. барацьбу за дэмакр. рэформы. У 1901 з дапамогай *Сацыял-дэмакратычнай партыі Данії* (СДПД, засн. ў 1876) Венстрэ атрымала большасць у ніжняй палаце парламента (фолькетынгу) і з санкцыі караля Крысціяна IX [1863—1906] сфарміравала першы адказны перад парламентам урад (у 1905—08 яго ўзначальваў Е.К.*Крыстэнсен*). Рэфарматары палепшылі становішча батракоў і беззямельных сялян, пашырылі аўтаномію Ісландыі (дадзена ў 1874). У 1905 з-за рознагалоссяў вакол ваен. бюджэту і буд-ва ўзбр. сіл з Венстрэ выйшлі пацыфісцкія колы, якія ўтварылі партыю Радыкальная Венстрэ. Нейтральная знешняя палітыка Д. пасля 1864 (у т.л. ў 1-ю сусв. вайну) садзейнічала яе эканам. росту (асабліва ў с.-г. вытв-сці) у 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. У 1915 прынята папраўка да канстытуцыі краіны (набыла сілу пасля 1-й сусв. вайны), паводле якой выбарчае права дадзена датчанам абодвух полаў з 25-гадовага ўзросту. У 1917 Д. прадала падуладную ёй частку Віргінскіх а-воў ЗША. У 1918 дацкія ўлады далі яшчэ большую самастойнасць Ісландыі ў межах міждзярж. уніі (скасавана Ісландыяй у 1944). У 1920 краіна прынята ў Лігу нацый, па выніках плебісцыту, праведзенага згодна з умовамі *Версальскага мірнага дагавора 1919*, да Д. далучаны Паўн. Шлезвіг. З 1924 найб. ўплыў у парламенце працяглы час мелі сацыял-дэмакраты, дзейнічаў кааліцыйны ўрад на чале з Т.*Стаўнінгам* (прэм'ер-міністр у 1924—26 і 1929—42), які рабіў захады па змяншэнні сац. напружанасці і аслабленні знешняй пагрозы (пакт аб ненападзе з нацысцкай Германіяй 1939). У 1933 Міжнар. суд у Гаазе вырашыў на карысць Д. яе спрэчку з Нарвегіяй з-за Грэнландыі. У 2-ю сусв. вайну краіна ў парушэнне дагавора 1939 акупіравана ням.-фаш. войскамі (9.4.1940). Акупац. ўлады захавалі ўрад Стаўнінга і дацкі парламент. У 1941 Д. вымушана стала чл. *«Антыкамінтэрнаўскага пакта»*; адначасова ў эміграцыі (Лондан) узнік Дацкі савет, які садзейнічаў актывізацыі Руху Супраціўлення ў краіне (з 1942). Пасля серыі антыфаш. забастовак і акцый сабатажу дацкіх працоўных акупац. ўлады 29.8.1943 ліквідавалі ўрад Э.Скавеніуса (прэм'ер-міністр з 1942), разброілі дацкую армію. Дацкі ВМФ часткова самазатапіўся. 5.5.1945 акупац. войскі ў Д. капітулявалі перад брыт. ўзбр. сіламі і падпольнай дацкай арміяй, 9.5.1945 сав. марскія пехацінцы вызвалілі в-аў Борнхальм. Першы пасляваенны ўрад на чале з В.Булем (1945) анулюваў усе заканад. акты, навязаныя краіне ў перыяд акупацыі, выключыў з дзярж. апарату былых калабарацыяністаў. Знешняя палітыка пасляваен. урадаў, якія ўзначальваліся пераважна прадстаўнікамі СДПД (у 1947—50, 1953—68, 1971—73, 1975—82 і П.Н.*Расмусенам* з 1993), была накіравана на інтэграцыю краіны ў зах.-еўрап. рэгіянальныя арг-цыі (НАТО, Савет Еўропы, Еўрап. эканам. супольніцтва і інш.). Дацкія ўлады далі самакіраванне Фарэрскім а-вам (1948) і Грэнландыі (1979, з 1953 састаўная ч. Дацкага каралеўства). Стабілізацыі эканомікі краіны пасля 2-й сусв. вайны садзейнічала эканам. дапамога паводле *Маршала плана*. Пры каралю *Фрэдэрыку IX* прынята сучасная канстытуцыя, паводле якой уведзены аднапалатны парламент (фолькетынг) і пераемнасць манархіі па жаночай лініі. З 1972 каралевай Д. з'яўляецца *Маргрэтэ II*. У 1992 і 1993 праведзены рэферэндумы па пытанні ўступлення краіны ў Еўрап. саюз (на

Да арт. **Данія**. Будынкі фахверкавай канструкцыі ў г. Орхус.

Да арт. **Данія**. Узбярэжжа зал. Орхус-Бутт на паўвостраве Ютландыя.

Да арт. **Данія**. Краявід паблізу г. Капенгаген.

апошнім большасць выбаршчыкаў дала станоўчы адказ). Д. — чл. ААН (з 1945), НАТО (пры ўмове неразмяшчэння на яе тэр. ў мірны час замежных войск, ваен. баз і ядз. зброі), Савета Еўропы (у абодвух арг-цыях з 1949), Еўрап. саюза. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены ў лют. 1992.

Палітычныя партыі і прафсаюзы. СДПД (найбуйнейшая), Сацыяліст. нар. партыя, Радыкальная Венстрэ, Венстрэ, Дэмакраты цэнтра, Хрысц. нар. партыя, Кансерватыўная нар. партыя, Партыя прагрэсу, Шлезвігская партыя, Цэнтр. аб'яднанне прафсаюзаў і інш.

Узброеныя сілы. Складаюцца з рэгулярных сухап. войск, ВПС, ВМС (на пач. 1995 агульная колькасць 27 тыс. чал.), і рэгулярных ваенізаваных фарміраванняў войск абароны (хемверн). Вярх. галоўнакамандуючы — манарх. Камплектуюцца паводле змешанага прынцыпу (да прызыву або найму не прыцягваюцца карэнныя жыхары Грэнландыі і Фарэрскіх а-воў). Сухап. войскі (16,3 тыс. чал.) уключаюць Ютландскую мотапяхотную дывізію, 2 мотапяхотныя брыгады на Зеландскіх а-вах, Борнхальмскую пяхотную брыгаду і інш. У складзе ВПС (6,1 тыс. чал.) 72 баявыя самлёты і часці ППА. ВМС (каля 4,5 тыс. чал. у пач. 1996) маюць 35 баявых караблёў (у т.л. 5 падводных лодак) і 30 баявых катэраў. Хемверн фарміруецца паводле тэр.-вытв. прынцыпу для дапамогі ўзбр. сілам. Каля 2 тыс. дацкіх вайскоўцаў — у войсках ААН (пераважна ў Босніі і Герцагавіне і на Кіпры).

Гаспадарка. Д. — высокаразвітая індустр.-агр. краіна. Па вытв-сці валавога нац. прадукту на душу насельніцтва (26 730 дол., 1993) займае адно з вядучых месцаў у свеце. Доля прам-сці каля 18% (у т.л. апрацоўчай 17%), сельскай гаспадаркі (разам з лясной гаспадаркай і рыбалоўствам) каля 5, буд-ва 5,5, транспарту і сувязі 7, гандлю 12, інш. абслуговых галін каля 50%. У структуры п р а м ы с л о в а с ц і пераважаюць галіны, цесна звязаныя са знешнім рынкам — з увозам сыравіны і паўфабрыкатаў і вывазам гатовых вырабаў. На знешнім рынку рэалізуецца больш як $^1/_3$ прамысл. і больш за $^1/_2$ с.-г. таварнай прадукцыі. Вядучыя галіны прам-сці: машынабудаванне, харч., хім. і тэкстыльная. У здабыўной прам-сці асн. значэнне маюць здабыча нафты (8,3 млн. т) і прыроднага газу (1,5 млрд. т, 1993). Здабываюць таксама буд. матэрыялы, каалін, дыятаміт, кухонную соль, торф і інш. Вытв-сць электраэнергіі 32,7 млрд. кВт·гадз (1993), пераважна на ЦЭС. У машынабудаванні вылучаецца суднабудаванне (прыкладна 3% штогадовага сусв. танажу; у Одэнсе, Хельсінгёры, Накскаве, Капенгагене, Ольбаргу), вытв-сць суднавых дызеляў (Капенгаген). Развіта вытв-сць абсталявання (пад'ёмна-трансп., для цэм., харч., суднабуд., цэлюлозна-папяровай прам-сці), мед. і быт. электратэхнікі. Гал. цэнтры: Капенгаген, Орхус, Одэнсе, Ольбарг (асабліва абсталяванне для цэм. прам-сці), Ранерс (лакаматыва- і вагонабудаванне), Хорсенс. Харч. прам-сць вылучаецца высокім узроўнем механізацыі. Акрамя малочных з-даў і бойняў у краіне шмат мукамольных, хлебапякарных, піваварных, кансервавых, спіртагарэлачных, цукровых, кандытарскіх, тытунёвых і інш. прадпрыемстваў. Асн. цэнтры: Капенгаген, Орхус, Одэнсе, Эсб'ерг (рыба- і мясакансервавыя прадпрыемствы), Ольбарг (рыбаперапрацоўка), Хорсенс (перапрацоўка тытуню, мяса, малака). Хім. прам-сць прадстаўлена вытв-сцю мінер. угнаенняў, сінт. смол, фарбаў, кіслот. Цэнтры нафтаперапрацоўкі і нафтахіміі — Калунбарг і Фрэдэрысія. Развіта фармацэўтычная прам-сць. З галін лёгкай прам-сці найб. развіта тэкстыльная (Капенгаген, Орхус, Одэнсе, Ольбарг, Ранерс, Колінг і інш.). Прадпрыемствы швейнай, абутковай, цэм. (штогод выпускаюць каля 2,5 млн. т цэменту), шкляной, фарфоравай, мэблевай прам-сці і інш. Каля палавіны прамысл. прадукцыі выпускаецца ў Капенгагене і яго прыгарадах. Д. — адна з вядучых у свеце краін па эфектыўнасці с е л ь с к а й г а с п а д а р к і. Характэрна высокая ступень выкарыстання машын. Каля 200 тыс. чал., занятых у с.-г. вытв-сці (78,8 тыс. фермаў, сярэдні памер 35 га), выпускаюць прадукцыю, якой можна пракарміць 15 млн. чал. Сярэдні надой малака каля 7 тыс. кг (тлустасць больш за 4%), сярэдняя ўраджайнасць збожжавых 50,5 ц/га. Доля с.-г. угоддзяў складае 64% тэрыторыі. Вядучая галіна — жывёлагадоўля, якая дае каля 90% таварнай с.-г. прадукцыі. Пагалоўе (млн. галоў, 1993): буйн. раг. жывёлы 2,2, свіней 11,1, птушкі 18,9. Штогадовая вытв-сць мяса дасягае 2 млн. т, малака — 5 млн. т, масла — 0,1 млн. т, сыру — 0,3 млн. т, яец — каля 90 млрд. штук. Земляробства абслугоўвае патрэбы жывёлагадоўлі. Каля палавіны с.-г. зямель пад кармавымі культурамі. Вырошчваюць (млн. т, 1993): пшаніцу — 4,3, ячмень — 3,3, жыта — 0,4, бульбу — 1,7, цукр. буракі — 3,6, авёс, бабовыя, рапс. Развіта агародніцтва, садоўніцтва. Штогадовы ўлоў рыбы каля 2 млн. т. Асн. рыбалавецкі порт Эсб'ерг. На адходах рыбалоўства развіта футравая зверагадоўля — вырошчванне норкі. Д. — краіна развітога міжнар. турызму. Штогод краіну наведвае больш за 10 млн. чал., гал. чынам з суседніх краін. Унутр. т р а н с п а р т пераважна аўтамабільны. Даўж. аўтадарог 71,1 тыс. км (1993), чыгунак 2,5 тыс. км, больш за 2 тыс. км электрыфікавана. Асноўныя астравы звязаны паміж сабой і з мацерыковай ч. краіны аўтамаб. і чыг. мастамі. Паромныя сувязі з Германіяй, Швецыяй, Нарвегіяй. Праз тэр. Д. праходзяць міжнар. аўтадарогі і чыгункі з Цэнтр. Еўропы ў Скандынавію. Грузападымальнасць марскога флоту 5 млн. т. На яго долю прыпадае каля $^1/_3$ унутр. і 80% знешніх перавозак. У перавозках дацкіх суднаў да 80% складаюць грузы замежных краін. Гал. порт Капенгаген. Развіты авіятранспарт заняты пераважна знешнімі перавозкамі пасажыраў. Д. мае дадатны штогадовы гандл. баланс. У агульным кошце экспарту (35,9 млн. дол., 1993) 69% прыпадае на прадукцыю прам-сці і 16% — на с.-г. прадукцыю, у імпарце 56% — на сыравіну і паўфабрыкаты і 18,5% — на машыны, абсталяванне і трансп. сродкі. Замежны гандаль вядзецца пераважна з Германіяй ($^1/_4$ экспарту і імпарту), Швецыяй (10% экспарту і 11% імпарту), Вялікабрытаніяй (9% экспарту і 8% імпарту), Нідэрландамі, Нарвегіяй, Францыяй, ЗША і інш. Д. ў асобныя гады экспартуе ў Беларусь лекі, пшаніцу, цукар, імпартуе трактары, прадукты дрэваапрацоўкі, ільняныя тканіны. Грашовая адзінка — дацкая крона.

Да арт. **Данія**. Карона караля Крысціяна IV.

Ахова здароўя. Сістэмай мед. абслугоўвання ахоплена ўсё насельніцтва Д. Лячэнне ў шпіталі і хатні мед. догляд за хворым бясплатныя. Дзеці і моладзь перыядычна праходзяць абавязковае бясплатнае мед. абследаванне. Сярэдняя працягласць жыцця ў мужчын 73, у жанчын 79 гадоў. Смяротнасць 11 на 1 тыс. чал. Забеспячэнне бальнічнымі ложкамі — 1 на 184 чал., урачамі — 1 тэрапеўт на 360 чал. Узровень нараджальнасці — 12 на 1 тыс. чал. Дзіцячая смяротнасць — 7 дзяцей на 1 тыс. нованароджаных (1994).

Асвета. Сучасная сістэма адукацыі Д. заснавана на законе 1974, паводле якога ўведзена адзіная абавязковая 9-гадовая школа (з 6 гадоў). Дашкольнае выхаванне ў Д. праводзіцца ў дзіцячых яслях і садах (да 6 гадоў). З 1976 уведзена перадшкольнае навучанне для дзяцей 5—6 гадоў (праводзіцца ў спец. класах пры школах і садах). Агульную адукацыю дае адзіная абавязковая нар. школа, якая складаецца з падрыхтоўчага класа, 9-гадовай асн. школы і 10-га (дадатковага) класа для тых, хто хоча працяг-

ваць навучанне ў сярэдніх навуч. ўстановах (гімназіі і сярэднія тэхн. ўстановы). Права паступлення ў ВНУ даюць гімназіі; з 1968 такое права маюць і асобы, якія не закончылі гімназію, але здалі вышэйшы падрыхтоўчы экзамен. Прафес. падрыхтоўку даюць прафес.-тэхн. навуч. ўстановы і спец. цэнтры ў выглядзе вучнёўства. Буйнейшыя ВНУ: ун-ты ў Капенгагене (з 1479), Орхусе (з 1928), Одэнсе (з 1964), Дацкая вышэйшая тэхн. школа (з 1829), Каралеўская вышэйшая вет. і с.-г. школа (з 1856), Вышэйшая камерцыйная школа (з 1917), Дацкая вышэйшая пед. школа (з 1856), Дацкая інж. акадэмія (з 1957). Найб. бібліятэкі: Нац. (Каралеўская, засн. паміж 1657 і 1664), б-ка ун-та (з 1482) і Муніцыпальная (з 1885) у Капенгагене, Дзярж. і б-ка ун-та ў Орхусе і інш. Найб. музеі: Нац. (з 1807), Дзярж. маст. музей, Каралеўскі музей прыгожых мастацтваў, Музей Торвальдсена — усе ў Капенгагене, Дом-музей Х.К.Андэрсена, Музей пад адкрытым небам даўніх вясковых забудоў у Одэнсе, Музей нац. гісторыі ў замку Фрэдэрыксбарг, Музей караблёў вікінгаў у Роскіле і інш. Навук. даследаванні праводзяцца ва ун-тах, галіновых ін-тах і акадэміях, цэнтрах і інш. н.-д. установах.

Друк, радыё, тэлебачанне. Першая рэгулярная газета выйшла ў 1666. Буйнейшыя сучасныя выданні: «Berlingske Tidende» («Ведамасці Берлінга», з 1749), «Aktuelt» («Актуальна», з 1872), «Fyns Tidende» («Фюнскія ведамасці», з 1872), «Politiken» («Палітыка», з 1884), «Ekstrabladet» («Экстранная газета», з 1904), «Land og Folk» («Краіна і народ», з 1941) і інш. Нац. інфарм. агенцтва Рытсаўс-бюро (РБ; з 1866; акц. т-ва). Радыёвяшчанне з 1925, тэлебачанне з 1951. Радыё- і тэлеперадачы кантралюе дзярж. служба Дацкага радыё.

Літаратура. Самыя стараж. помнікі дацкага пісьменства — рунічныя надпісы 9—12 ст. Першыя літ. помнікі — зборнікі законаў і хронік на лац. мове («Учынкі данаў» Саксона Граматыка, нап. ў 1208). У сярэдневякоўі апрача лац. хронік ствараліся нар. балады і песні (фольквізер). Першая друкаваная кніга на *дацкай мове* — гіст. праца «Рыфмаваная хроніка» (1495). У 16 ст. развіццю л-ры садзейнічалі Рэфармацыя і кнігадрукаванне. Пераклад Бібліі К.Педэрсена (1550) стаў асновай для фарміравання дацкай літ. мовы. У гэты час у Д. пранікае л-ра італьян. і галандскага Адраджэння, франц. класіцызму. Найб. значныя творы — «Візітная кніга» П.Паладыуса і «Хроніка дацкага каралеўства» А.Гуітфельда. У 17 ст. ў дацкай л-ры адзначаецца заняпад. У творчасці А.К.Арэба знайшла адбітак паэзія барока, якая дасягае завершанасці ў царк. песнях Т.Кінга. Пачынае выходзіць першы часопіс «Дацкі Меркурый». У 18 ст. ў Д. набываюць папулярнасць ідэі Асветніцтва, выдатным прадстаўніком якога быў Л.Хольберг — пісьменнік, філосаф, гісторык, заснавальнік сучаснай дацкай л-ры, стваральнік нац. тэатра (1722), рэфарматар мовы. У сярэдзіне 18 ст. пашыраецца сентыменталізм (І.Эвальд, А.А.К.Стуб). У 19 ст. ў дацкай л-ры пануе раманцызм, найб. значны прадстаўнік якога паэт і драматург А.Г.Эленшлегер. Да раманц. кірунку адносіцца творчасць Н.Ф.Грунтвіга — філосафа, мараліста, «дацкага Лютэра». У 1830-я г. ў дацкую л-ру ўваходзіць Х.К.*Андэрсен*, казкі і гісторыі якога ўзнялі дацкую л-ру на сусв. ўзровень. У сярэдзіне 19 ст. развіваюцца паліт. лірыка і сатыра, асабліва ў творчасці Ф.Палудан-Мюлера (вершаваны раман «Adam Homo»). Пісьменнік і філосаф С.*К'еркегор* заснавальнік сучаснай л-ры экзістэнцыялізму, зрабіў значны ўплыў на скандынаўскую і еўрап. л-ры. Важная роля ў развіцці рэалізму ў дацкай л-ры належала крытыку і гісторыку Г.Брандэсу. Выдатны пісьменнік-рэаліст Е.П.Якабсен у рамане «Нільс Люне» паказаў трагічны лёс інтэлігента, які апынуўся адзінокім ва ўмовах тагачаснага жыцця. У 1880-я г. ў л-ры Д. пераважае сімвалізм: Г.Банг, І.Ёргенсен, нават у пісьменнікаў рэаліст. кірунку Х.Драхмана, К.*Гелерупа*. У 1890-я г. адбываецца паварот да рэалізму: Г.Пантопідан («Шчасліўчык Пер»), І.В.Енсен («Хімерландскія гісторыі»); сатыр. драмы пісаў Г.І.Від, псіхал. раманы і навелы — К.Мікаэліс. На пач. 20 ст. развіццё крытычнага рэалізму звязана з творчасцю М.*Андэрсена-Нексё*. У канцы 1920-х г. адзначаецца паварот да рэаліст. прозы (Андэрсен-Нексё, Х.Р.Кірк, Х.Шэрфіг, Э.Крыстэнсен, К.Бекер), гуманістычнай паэзіі (О.Гельстэд); у творчасці К.Мунка развіваецца філасофска-рэаліст. кірунак. У пасляваен. час у л-ры працуюць маладыя літаратары, аб'яднаныя вакол час. «Heretica» («Ерась», 1948—53), творчасць якіх характарызавалася ўцёкамі ад рэчаіснасці ў філас.-эстэт. разважанні (О.Сарвіг, О.Вівель, Т.Б'ёрнвіг, Ф.Егер). У 1950-я г. ў л-ру прыйшлі т.зв. новыя мадэрністы, якія абвясцілі абнаўленне ў галіне формы і грамадскі радыкалізм (В.Сёрэнсен, К.Рыфб'ерг, П.Себерг, Л.Пандура). Маст. і філас. пошукі гэтых розных па сваёй індывідуальнасці пісьменнікаў не супадалі з агульнымі працэсамі ў грамадстве і прывялі большасць з іх да чарговай эстэт. пераацэнкі, у рэчышча «новага» рэалізму (К.Кампман, Х.Стангеруп, Х.Ё.Нільсен, Е.Х.Сёрэнсен, У.Далеруп, С.О.Мадсен).

Да арт. **Данія**. Б.Торвальдсен. Ганімед. 1804.

Да арт. **Данія**. Вадзяны млын на востраве Фюн. 1700—1800.

Да арт. **Данія**. І.Т.Лунбю. Царква ў Калунбаргу. 1837.

Архітэктура. Ад «эпохі вікінгаў» (канец 8 — сярэдзіна 11 ст.) захаваліся рэшткі крэпасцей Трэлебарг на в-ве Зеландыя, Агерсбарг каля Лім-фіёрда. З часу стварэння дацкага каралеўства (10 ст.) і прыняцця хрысціянства (каля 960) пачалося буд-ва драўляных, а з сярэдзіны 11 ст. — каменных (царква Божай Маці ў Роскіле) базілікальных цэркваў. У раманскі перыяд (12 — пач. 13 ст.) будавалі крыжова-купальныя саборы ў Рыбе і Вібаргу. Помнікі готыкі (13 — пач. 16 ст.): саборы ў Роскіле і Одэнсе. У 16 — 1-й пал. 17 ст. будавалі палацы,

грамадскія і жылыя будынкі (біржа і палац Росенбарг у Капенгагене), у дэкоры якіх выявіўся ўплыў *Адраджэння*. Выдатны помнік архітэктуры 18 ст. — ансамбль Амаліенбарг (арх. Н.Эйтвед, Н.Жардэн). Перайманне стыляў інш. эпох і эклектызм характэрны для 2-й пал. 19 ст. У канцы 19 ст. ўзнік нац. рамантызм (арх. М.Нюрап, П.В.Енсен-Клінт і К.Клінт). Шляхі развіцця сучаснай архітэктуры Д. супадаюць са шляхамі яе развіцця ў Швецыі. Разам з тым захаваліся традыцыі дацкай цаглянай архітэктуры. З 1930-х г. пашыраны функцыяналізм (ун-т у Орхусе, 1932—46, арх. К.О.Фіскер і інш.; Дзярж. радыёцэнтр у Капенгагене, 1938—45, арх. В.Т.Лаўрытсен). Сярод найб. вядомых

Да арт. **Данія**. Ратуша ў Орхусе. Арх. А.Якабсен і інш. 1938—42.

архітэктараў Д. — А.*Якабсен* (ратуша ў Рэдаўрэ, 1954—56, будынак авіякампаніі «САС» у Капенгагене, 1959—61, і інш.), аўтар праекта сусв. вядомага опернага т-ра ў Сіднеі (Аўстралія, 1966) Ё.Утсан.

Выяўленчае мастацтва. Помнікі маст. культуры вядомы з 8-га тыс. да н.э.: кромлехі і дальмены эпохі неаліту і бронзы; наскальныя выявы сцэн войнаў і палявання на в-ве Борнхальм эпохі бронзы; сярэбраны посуд і залатыя манеты жал. веку. У размалёўках раманскіх цэркваў («Хрыстос у славе», царква Себю на в-ве Зеландыя) — выявы ў візант. традыцыях у спалучэнні з мясц. арнаментам, які дамінуе і ў скульптуры (алтар з царквы ў Лісб'ергу). З 2-й пал. 15 ст. ў Д. імпартавалася шмат маст. твораў з Германіі, Нідэрландаў, Францыі, прыязджалі майстры, што працавалі тут да сярэдзіны 18 ст. Заснаванне ў Капенгагене АМ (1754) спрыяла развіццю *класіцызму*, які панаваў у Д. ў 2-й пал. 18 ст. — 1-й пал. 19 ст. У гэты час складваецца нац. маст. школа (скульпт. І.Відэвельт, Б.*Торвальдсен*, жывапісец Н.Абільгар). У партрэтным і пейзажным жывапісе (В.Эрыксен, Е.Юль) спалучаюцца рысы стыляў барока, ракако і класіцызму. Вызначальнае месца ў жывапісе 1-й пал. 19 ст. належала К.В.*Экерсбергу* і яго паслядоўнікам К.*Кёбке*, В.Бендсу, І.Т.Лунбю і інш., творы якіх блізкія да *бідэрмееру*. Жывапіс мастакоў наступнага пакалення (К.Хансен, В.Марстран) набыў рысы *акадэмізму*. З 1880-х г. пачаўся росквіт

Да арт. **Данія**. Адна з залаў Музея Торвальдсена ў Капенгагене.

Да арт. **Данія**. К.Кёбке. Сястра мастака. 1831.

маст. фарфору (сервізы і статуэткі з падглазурнай размалёўкай мяккіх тонаў). Новаму ўздыму жывапісу садзейнічала творчасць мастакоў аб'яднання «Вольная выстаўка» (засн. ў 1891), якія пасяліліся ў в. Скаген (Паўн. Ютландыя) і займаліся вырашэннем праблемы *пленэру* (рэалісты П.С.*Кроер*, В.Іохансен, А.Ерндарф, пачынальнік дацкага імпрэсіянізму Т.Філіпсен). Творчасць Філіпсена істотна паўплывала на групу пейзажыстаў і анімалістаў, што паявіліся на в-ве Фюн, — П.Хансена, Ф.Сюберга, І.Ларсена, П.Крысціянсена. Тэму гісторыі Д. ўвасабляў К.Сартман. Мастакі Е.Ф.Вілумсен, В.Хамерсхёй, Э.А.Нільсен імкнуліся да *сімвалізму* і т.зв. нардычнага экспрэсіянізму. У 1910-я г. ў мастацтве заўважны ўплыў *фавізму*, *кубізму* і інш. новых плыней (Х.Гірсінг, Э.Вее). З 1930-х г. у мастацтве панаваў *эклектызм* (Э.Альфельт, Э.Біле, Э.Якабсен), якому процістаялі рэаліст. жывапіс О.Рудэ, Х.Енсена, графіка І.Крыстэнсена, паліт. і быт. карыкатуры Х.*Бідструпа*. У скульптуры 1-й пал. 20 ст. працавалі К.Нільсен, Ж.Гоген, І.К.Б'ерг і інш.

Музыка Д. была адносна развітой ужо ў першыя стагоддзі да н.э. Сярод стараж. муз. інструментаў духавыя рог і лур (4 ст. да н.э.). У сярэдневякоўі былі пашыраны гераіка-эпічныя песні — драпы, сагі, якія выконвалі скальды. З 12 ст. развіваецца прафес. культавая, у 15—16 ст. і свецкая музыка (прыдворныя капэлы). У 16 ст. на музыку Д. значна паўплывала *нідэрландская школа*. Найб. значны кампазітар 17 — пач. 18 ст. Дз.*Букстэхудэ*. Узнікненне дацкай нац. оперы падрыхтавалі *зінгшпілі* і музыка да драм. спектакляў Ф.Кулаў, а таксама Ф.Кунцэна, І.А.П.Шульца, К.Э.Ф.Вайсе і інш. З 19 ст. вывучаецца нац. фальклор. Лепшыя прадстаўнікі дацкага муз. рамантызму Н.*Гадэ*, стваральнік першай нац. оперы І.П.Э.Хартман («Маленькая Кірстэн» паводле Х.К.Андэрсена, 1846), К.Хорнеман, П.А.Хейсе. Вял. ролю ў станаўленні нац. балета адыграла дзейнасць А.*Бурнанвіля*. Заснавальнік сучаснай кампазітарскай школы К.*Нільсен*. У розных муз. жанрах вылучыліся кампазітары П.Э.Ланге-Мюлер, К.Рысагер, Ф.Хёфдынг, С.Э.Тарп, А.Хамерык, Э.Хамерык, Ё.Ерсіль, В.Хольмбу, Н.В.*Бентсан*, П.Нёргар, П.Р.Ольсен і інш. Сярод выканаўцаў дырыжор Э.Туксен, спявак Л.Мельхіяр і інш. У Д. працуюць (1988): 5 кансерваторый, 5 хар. саюзаў, 2 саюзы кампазітараў і інш. Выдаюцца 15 муз. часопісаў.

Тэатр. Элементы тэатр. мастацтва былі ў творчасці стараж. скандынаўскіх спевакоў — скальдаў. У сярэднія вякі пашыраны паказы «нараў», містэрый, літургічных драм, маралітэ. У 1722 у Капенгагене адкрыты т-р «Дацкая сцэна» (з 1770 наз. Каралеўскі т-р). Драматургія 18 ст. (асабліва Л.Хольберга) і творчасць выдатных акцёраў (К.А.Г'ельструп і інш.) залажылі асновы нац. камед. акцёрскай школы. У 1-й

пал. 19 ст. творы А.Эленшлегера вызначылі развіццё школы акцёраў-раманты-каў (І.К.Руге, Н.П.Нільсен і інш.). П'есы І.Л.Хейберга, Е.К.Хострупа, Г.Херца спрыялі росквіту сцэн. рэалізму. У канцы 19 ст. ставіліся востракрытычныя, гуманіст. драмы Г.Ібсена. У пач. 20 ст. т-р перажываў крызіс, у 1930-я г. — уздым, які прывёў да росквіту тэатр. мастацтва і драматургіі. Ставіліся антыфаш. спектаклі па п'есах К.Абеля, К.Э.Соі, К.Мунка. У час ням.-фаш. акупацыі ставіліся гіст. п'есы, дацкая класіка, пасля вызвалення — п'есы пра ваенныя гады, гераізм удзельнікаў Руху Супраціўлення. У 1950—70-я г. ставіліся пераважна п'есы сучасных зах.-еўрап. і амер. драматургаў. Да твораў нац. і сусв. класікі звяртаўся найчасцей Каралеўскі т-р, які і цяпер прадаўжае рэаліст. традыцыі. Працуюць Нар. т-р (засн. ў 1857), «Новы тэатр» (1908), «Гладсакс-тэатр» (1964), «Ню Скала» (1912) — усе ў Капенгагене, т-ры ў Ольбаргу, Одэнсе, Орхусе і інш. Дзейнічае Дзярж. драм. школа ў Капенгагене. З 1979 праходзяць міжнар. «Фестывалі блазнаў», дзе прадстаўлены тэатр. калектывы ўсіх жанраў.

Кіно. Пачынальнік дацкага кінематографа — фатограф Л.П.Эльфельт, які ў 1896—97 зняў першы дакумент., а ў 1903 — маст. фільмы. З 1906 дзейнічала кінастудыя «Нордыск фільмс компані» (засн. О.Ольсен), што набыла міжнар. вядомасць дзякуючы фільмам В.Ларсена, П.У.Гада, А.Блома, А.В.Сандберга з удзелам вядомай актрысы нямога кіно А.Нільсен. У пач. 20 ст. кіно Д. займала вядучае месца ў Еўропе (штогод ствараліся каля 150 фільмаў). Далейшае яго развіццё прыпыніла эміграцыя вядучых кінарэжысёраў. У 1920-я г. здымаліся камедыі Л.Лаўрытсена з удзелам коміка Х.Мадсена і К.Шэнстрэма (вядомыя як Пат і Паташон). У канцы 1920-х—30-я г. вытворчасць фільмаў рэзка знізілася. У гады ням.-фаш. акупацыі развівалася дакумент. кіно (К. і Ё.Рос, Т.Крыстэнсен, А. і Б.Хенінг-Енсен, О.Пальсба). У 1950-я г. кіно Д. аддавала ўвагу сац. праблемам. Але яго развіццё стрымлівала ўзнікненне тэлебачання. У 1972 у Д. створаны Дзярж. ін-т кіно. У 1960-я г. маніфестам кіно Д. стала творчасць П.К'ерульфа-Шміта. У 1970—80-я г. вылучыліся карціны, прысвечаныя моладзі (рэж. Н.Мальмрас, М.Арнфрэд, Б.Аўтуст). Папулярнасцю карыстаецца серыя камедый Э.Балінга пра шайку Ольсена (з удзелам коміка О.Спрогё), а таксама фільмы Х.Карлсена і Е.Б.Карлсена, Э.Клаўсена, А.Хенінг-Енсен, Г.Акселя, К.Хострупа з удзелам акцёраў Г.Бюрне, Х.Мірэн, К.Бале.

Літ.: Лебедев Г.С. Эпоха викингов в Северной Европе: Ист.-археол. очерки. Л., 1985; Славяне и скандинавы: Пер. с нем. М., 1986; Коган М.А. Просвещенный абсолютизм в Дании. Реформы Струензе. Лекция. М., 1972; Кудрина Ю.В. Дания в годы второй мировой войны. М., 1975; Карлсен А.-В. Современная Дания. М., 1981; Неустроев В.П. Литература скандинавских стран (1870—1970). М., 1980; Искусство стран и народов мира. Т. 1. М., 1962; Danmarks arkitektur. Bd 1—5. Lund; København, 1979—80; Мохов Н. Некоторые страницы истории датской музыки // Исследования исторического процесса классической и современной зарубежной музыки. М., 1980; Schirring N. Musikkens historie i Danmark. Bd 1—3. København, 1977—78.

П.І.Рогач (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *У.Я.Калаткоў* (гісторыя), *У.Л.Сакалоўскі* (літаратура), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўленчае мастацтва).

ДА́ННІКІ, феадальна-залежныя сяляне ў ВКЛ у 14—16 ст., якія плацілі феад. зямельную рэнту пераважна ў форме *даніны* (збожжа, мяса, мёд, воск, футра і інш.). Асн. адзінкай абкладання данінай служыў дым (сял. гаспадарка), але за яе выплату адказвала супольна ўся абшчына. Да канца 15 ст. Д. былі пераважнай катэгорыяй сялян. З развіццём

Да арт. **Данія**. Царква Грунтвіга ў Капенгагене. Арх. П.В.Енсен-Клінт, К. Клінт. 1921—40.

Да арт. **Данія**. Інтэр'ер жылога пакоя сялянскага дома з вострава Зеландыя. 1800.

таварна-грашовых адносін да сярэдзіны 16 ст. на З і часткова ПнУ Беларусі Д. паступова ператварыліся ў паншчынных (гл. *Цяглыя сяляне*) і чыншавых (гл. *Асадныя сяляне*) сялян. Д. гаспадарскіх падняпроўскіх валасцей у выніку агр. рэформы 1560 ператварыліся ў чыншавых сялян. *М.Ф.Спірыдонаў.*

ДАНО́С заведама лжывы, наўмыснае хлуслівае паведамленне органам улады пра злачынства, якое нібыта ўчынена або падрыхтоўваецца. Паводле крымін. заканадаўства Рэспублікі Беларусь адно са *злачынстваў супраць правасуддзя*. Абцяжваючымі адказнасць вінаватага ў Д. акалічнасцямі з'яўляюцца абвінавачанне ім абылганага ў асабліва

Да арт. **Данскі манастыр**. Надбрамная царква Ціхвінскай Багародзіцы. 1713—14.

небяспечным дзярж. або інш. цяжкім злачынстве ці спалучанае са штучным стварэннем доказаў абвінавачвання, а таксама Д., зроблены з карыслівай мэтай.

ДАНСА́НТНАСЦЬ (ад франц. dansant танцавальны), танцавальнасць, сукупнасць фармальных якасцей музыкі, якія робяць яе зручнай для танца і выяўляюць танец. Д. садзейнічае зліццю музыкі і танца ў адзінае маст. цэлае, прадугледжвае дакладнасць метрарытмічнай арганізацыі, падкрэсленую акцэнтоўку моцных доляў і апорных момантаў у

мелодыі і акампанеменце. Развіваецца ў балеце гістарычна з узмацненнем сувязі балетнай музыкі са спецыфічнымі задачамі танца.

ДАНСКІ́ МАНАСТЫ́Р, мужчынскі манастыр у Маскве. Засн. ў 1591. На яго тэрыторыі: 1-купальны Малы сабор (1591—93) з трапезнай (1678) і шатровай званіцай (1679); 5-купальны Вялікі сабор з галерэяй (1684—93; іканастас 1693—99, размалёўкі 1792 па эскізах В.Бажэнава); Ціхвінская надбрамная царква (1713—14, прыпісваецца арх. І.Заруднаму); званіца на зах. браме (1753, арх. А.Еўлашаў); царква Архангела Міхаіла ў стылі класіцызму (капліца кн. Галіцыных, 1805, арх. І.Еготаў; у ёй збор надмагілляў работы І.Мартаса і інш.); некропаль дзеячаў гісторыі і культуры. У паўд.-ўсх. частцы манастыра могілкі (з канца 17 ст.), дзе пахаваны ўдзельнікі вайны 1812, дзекабрысты і інш.

Літ.: Аренкова Ю.И., Мехова Г.И. Донской монастырь. М., 1970.

ДАНСКО́Й, гл. *Дзмітрый Іванавіч Данской*.

ДАНСКО́Й Марк Сямёнавіч (6.3.1901, г. Адэса, Украіна — 21.3.1981), расійскі кінарэжысёр і сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1966). Герой Сац. Працы (1971). Скончыў Сімферопальскі ун-т (1924). З 1925 працаваў у кіно. Яго творчасць адметная стварэннем каларытных чалавечых характараў і лёсаў, яркіх быт. сцэн: трылогія «Дзяцінства Горкага», «У людзях», «Мае універсітэты» (1938—40), «Вясёлка» (1944), «Няскораныя» (1945), «Сельская настаўніца» (1947), «Дарагой цаной» (1958), «Фама Гардзееў» (1959). Дзярж. прэмія СССР 1941, 1946, 1948, 1968.

ДАНТО́Н (Danton) Жорж Жак (28.10.1759, г. Арсі-сюр-Об, Францыя — 5.4.1794), дзеяч *Французскай рэвалюцыі 1789—99*, адзін з правадыроў *якабінцаў*. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 10.8.1792, якое скінула манархію. Быў дэпутатам Канвента, міністрам юстыцыі ў новым урадзе. З 1793 член *Камітэта грамадскага выратавання*; выступаў за прымірэнне з *жырандыстамі*, супраць рэв. тэрору. Асуджаны рэв. трыбуналам, гільяцінаваны.

Літ.: Левандовский А.П. Дантон. Ростов н/Д, 1997.

ДА́НТЭ Аліг'еры (Dante Alighieri; 15.5 ці 15.6.1265, г. Фларэнцыя, Італія — 13 ці 14.9.1321), італьянскі паэт. Па некат. звестках, вучыўся ў Балонскім ун-це. У 1300 адзін з прыёраў Фларэнцыі, у 1301 амбасадар горада пры папскім двары ў Рыме. Быў абвінавачаны ў выступленнях супраць папы і гар. улад і прыгавораны да спалення на кастры; усё астатняе жыццё правёў у выгнанні. У ранніх вершах апяваў Беатрычэ Партынары, каханне да якой пранёс праз усё жыццё. Гэтыя вершы і далучаная да іх проза на італьян. мове склалі першы буйны твор — «Новае жыццё» (1291—93, выд. 1576), у якім распрацаваў правілы «новага салодкага стылю» (ускладненыя маральна-філас. ідэі, сімволіка і алегарызм, вытанчанасць маст. формы). Пазней яго творчасць развівалася ў 2 кірунках: на лац. мове стварыў трактаты па пытаннях італьян. мовы («Пра народнае красамоўства», 1303—04), аб дзярж. уладзе («Пра манархію», 1312—13), на італьян.



Дантэ.

М.В.Данцыг.

мове — трактат, прысвечаны філас., маральным і літ. пытанням («Баль», 1304—07) і вершы (т.зв. «рыфмы»). У 1311—13 напісаў 13 «Пасланняў» на лац. мове, эклогі, а таксама трактат «Спрэчка аб вадзе і зямлі» (1320). Вяршыня творчасці Д. — «Боская камедыя» [1306—1318(?)—21]. Гэты манум. твор позняга сярэднявечча ўяўляе сабой энцыклапедыю філасофіі, касмагоніі, гісторыі, рэлігіі, маралі, паліт. поглядаў еўрап. чалавека напярэдадні Адраджэння. Твор падзелены на 3 часткі (кантыкі): «Пекла», «Чысцец» і «Рай». У алегарычнай форме Д. гаворыць аб сучаснасці, яскрава звязваючы яе з Антычнасцю. Стройная лагічная схема твора базіруецца на сімволіцы лічбаў (пачынаючы ад лічбы 3 — сімвала Тройцы: 3 кантыкі, тэрцына — асн. вершаваны памер, кожная кантыка складаецца з 33 песняў і г.д.). Творчасць Д. зрабіла вял. ўплыў на развіццё л-ры. Яго творы перакладзены амаль на ўсе мовы свету. На бел. мову «Боскую камедыю» пераклалі Я.Семяжон, А.Мінкін, У.Скарынкін.

Тв.: Le opere di Dante. Firenze, 1965; Рус. пер. — Новая жизнь; Божественная комедия. М., 1967; Малые произведения. М., 1968.

Літ.: Enciclopedia Dantesca. Roma, 1970—85; Голенищев-Кутузов И.Н. Данте. М., 1967. *С.В.Логіш*

ДАНУКА́ЛАЎ Аляксей Фёдаравіч (29.2.1916, с. Новарасляёўка Саратаўскай вобл., Расія — 27.4.1944), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на тэр. Віцебскай і Смаленскай абл. у Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Балашоўскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (1936), Іркуцкае ваен. вучылішча (1941). У Вял. Айч. вайну ўдзельнік абароны Лепеля, Оршы, Смаленска. Трапіўшы ў акружэнне, у жн. 1941 арганізаваў партыз. атрад «Радзіма», які ў крас. 1942 рэарганізаваны ў брыгаду «Аляксей», камандзірам якой быў Д. (пазней партыз. брыгада яго імя). Падпалкоўнік Д. загінуў у баі ў час выхаду з блакады. У Лепелі на яго магіле помнік, у в. Кавалі Лёзненскага р-на мемар. музей Д., установлены яго бюст.

ДА́НЦЫГ (Danzig), нямецкая назва г. *Гданьск* у Польшчы.

ДА́НЦЫГ Май Вольфавіч (н. 27.4.1930, Мінск), бел. жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1973). Нар. мастак Беларусі (1995). Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1952), Маскоўскі маст. ін-т імя Сурыкава (1958). З 1958 выкладае ў Бел. АМ (праф. з 1980). Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Сярод работ: тэматычныя карціны «Раніца новага Мінска» (1959), «Партызанскае вяселле» (1968), «Купалаўскія радкі» (1972), «Легенда Беларусі» (1975), «І памятае свет уратаваны...» (1985—95); лірычныя пейзажы «Стары і новы Мінск» (1963), «Цішыня» (1976), «Бацькаўшчына мая» (1982), «Мая Лагойшчына» (1985), серыя «Віцебск — радзіма Шагала» (1994); нацюрморты «Бэз» (1962), «Аб Вялікай Айчыннай...» (1968), «Ялінка» (1971), «Палітра новабудоўляў» (1979); партрэты «Сталявар» (1956), «Кінарэжысёр Э.Клімаў» (1985),

М.Данцыг. І памятае свет выратаваны... 1985—95.

пісьменнікаў А.Адамовіча і В.Быкава (абодва 1986) і інш. З твораў манум. жывапісу: мазаічнае пано ў кінатэатры «Партызан» (1966), мазаіка ў гасцініцы «Юбілейная» (1969, з Б.Няпомнячым) — абодва ў Мінску. Творам Д. ўласцівы арыгінальныя кампазіцыйныя рашэнні, драматургічнасць зместу. Канструктыўна-пластычнае валоданне колерам, спалучэнне прыёмаў манум. і станковага мастацтваў, метафарычнасці і канкрэтыкі дазваляюць яму ствараць яркія маст. вобразы, поўна раскрыць сваю творчую індывідуальнасць. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1968.

Літ.: Сурский О.А. М.В.Данциг. М., 1975; Крэпак Б.А. Май Данцыг. Мн., 1976; Петэрсан С. Убачым новыя творы // Мастацтва. 1995. № 9. *Л.Ф.Салавей.*

ДА́НЧАНКА Рыгор Міхайлавіч (н. 25.12.1942, г.п. Тураў Гомельскай вобл.), бел. плакатыст. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). Працаваў у ін-це «Белбыттэхпраект», «Агітплакаце» (1975—90), цяпер на Мінскім маст.-вытв. камбінаце (з 1975). Творам Д. ўласціва лаканічнасць і строгасць формы, ашчадная выразнасць маст. мовы. Аўтар плакатаў: «Адновім помнікі архітэктуры» (1978), «Тураву — 1000 год» (1980), «Небяспечней эпідэміі» (1981), «Раззбраенне!» (1982), «Вайна — вайне!», «Хлеб — усяму галава» (абодва 1983), «Чарнобыльскі боль» (1994). Працуе ў жанры партрэта («Кірыла Тураўскі», 1980, і інш.), займаецца рэканструкцыяй арх. помнікаў (Тураўскі храм 12 ст., 1981; Тураўскі замак і гарадзішча, 1981—84; Полацкі замак, 1996).

ДА́НЧАНКА Сяргей Уладзіміравіч (н. 17.3.1937, г. Запарожжа, Украіна), украінскі рэжысёр. Нар. арт. СССР (1988). Скончыў Кіеўскі ін-т тэатр. мастацтва (1965). З 1978 гал. рэжысёр Кіеўскага ўкр. драм. т-ра імя І.Франко. Сярод пастановак: «Каменны ўладар» Л.Украінкі (1971), «Украдзенае шчасце» Франко (1979), «Дзядзька Ваня» А.Чэхава (1980). Дзярж. прэміі Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1978 і СССР 1980.

ДАНЧУ́К Вікторыя Яфімаўна (н. 7.7.1944, с. Княжыкі Чаркаскай вобл., Украіна), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла вучылішча прыкладнога мастацтва ў г. Косаў (Украіна; 1964), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). З 1970 працавала на Мінскім маст.-вытв. камбінаце, з 1983 у акцыянерным т-ве «Мінскі фарфоравы завод». Працуе ў кераміцы. Выканала манум. дэкар. пано для паштамта ў г. Дзяржынск — «Гісторыя пошты» (1980), для Мядзельскага музея нар. славы — «Стары Мядзел», «Новы Мядзел», «Вялікая Айчынная вайна», «Старадаўнія рамёствы», «Фальклор» (усе 1983—87). Аўтар дэкар. пластыкі «Праметэй» (1975), «Сям'я» (1976), «Сілуэты часу» (1977), «Васількі» (1985) для Нац. т-ра імя Я.Купалы, сервізаў «Успамін» (1986), «Чараіт» (1997) і інш.

ДА́НЧЫК (сапр. Андрусышын Багдан; н. 3.1.1958, Нью-Йорк), амерыканскі і бел. спявак (лірычны тэнар), журналіст. З роду пачынальнікаў бел. адраджэння 20 ст. І. і А.Луцкевічаў (прабабка спевака Э.Шабуня іх родная сястра). Скончыў ф-т журналістыкі Нью-Йоркскага ун-та (1989). З 1992 працуе на радыёстанцыі «Свабода». Адзін з найб. яркіх сучасных выканаўцаў бел. песні ў ЗША і Канадзе. Мае прыгожы голас мяккага пяшчотнага тэмбру. Выкананне адметнае шчырасцю, асэнсаванасцю. У рэпертуары пераважаюць творы бел. кампазітараў на словы бел. паэтаў і бел. нар. песні. У Нью-Йорку выпушчана 5 грампласцінак з бел. песнямі і рамансамі ў выкананні Д. (адна з іх у дуэце з Л.*Барткевічам*), а таксама магнітаальбомы. Неаднаразова наведваў Беларусь, даў шэраг канцэртаў, у т.л. дабрачынныя на карысць дзяцей, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы 1986. На кінастудыі «Беларусьфільм» пра яго зняты дакумент. фільм (1989).

Літ.: Сабалеўскі А. Данчык — шлях да Беларусі // Культура беларускага замежжа. Мн., 1993. Кн. 1; Яго ж. Ля вытокаў культурнага адраджэння: (Данчык у Беларусі) // Там жа. Кн. 2. *А.В.Сабалеўскі.*

ДАНЬКЕ́ВІЧ Канстанцін Фёдаравіч (24.12.1905, г. Адэса, Украіна — 24.2.1984), украінскі кампазітар, дырыжор, педагог. Нар. арт. СССР (1954). Скончыў Адэскі муз.-драм. ін-т (1929). З 1929 выкладаў у Адэскай (праф. з 1948, рэктар у 1944—51), у 1953—69 — у Кіеўскай кансерваторыях. У 1956—67 старшыня праўлення Саюза кампазітараў Украіны. Сярод твораў: оперы «Трагедыйная ноч» (1935), «Багдан Хмяльніцкі» (1951), «Назар Стадоля» (1960), балет «Лілея» (1939); 2 сімфоніі; сімф. паэма «Тарас Шаўчэнка», (1939), камерныя, хар. творы, музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1978.

Літ.: Михайлов М.М. Константин Данькевич. 2 вид. Київ, 1974.

ДАНЬКО́, Данько-Аляксеенка Наталля Якаўлеўна (1892, Тбілісі — 18.3.1942), рускі скульптар-кераміст. У 1900—08 вучылася ў прыватных студыях і вучылішчах Масквы, Вільні, Пецярбурга. З 1914 працавала ў Петраградзе на імператарскім (з 1918 дзяржаўны) фарфоравым з-дзе. Стварыла больш за 300 паліхромных фарфоравых груп, фігурак, рэльефных пасудзін і скульпт. настольных прыбораў (у т.л. творы т.зв. агітацыйнага фарфору), якія вызначаюцца пластычнай выразнасцю матэрыялу, развіццём традыцый рус. нар. керамікі і маст. фарфору.

Літ.: Овсянников Ю.М. Скульптор в красном халате. М., 1965.

ДАНЯЛЮ́К Аляксандр Пятровіч (парт. псеўд. Эдмунд Стафанскі, Олек, Зянон; 30.11.1897, Варшава — люты 1937), дзеяч Кампартыі Польшчы і КПЗБ. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. Чугуеўскага рэўкома. З 1919 у Польшчы. У 1921—23 сакратар акр. к-та Дамброўскага басейна КПП, чл. ЦК Кампартыі Усх. Галіцыі, у 1923—29 канд. у чл. ЦК КПП. Удзельнік арганізац. афармлення КПЗБ, прадстаўнік ЦК КПП на II (1924) канферэнцыі КПЗБ. У 1924 кааптаваны ў ЦК, чл. Сакратарыята ЦК КПЗБ. Дэлегат V (1924) кангрэса Камінтэрна. За рэв. дзейнасць тройчы арыштаваны польск. ўладамі. У 1930 у апараце Выканкома Камінтэрна. У 1931—35 у Кампартыі Румыніі: чл. ЦК і Палітбюро ЦК. З канца 1935 у СССР на гасп. рабоце. У лют. 1937 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1955.

ДАПАМО́ЖНАЯ ШКО́ЛА, спецыяльная навучальна-выхаваўчая ўстанова для разумова адсталых дзяцей, задача якой — максімальная карэкцыя парушэнняў іх псіхічнага і фіз. развіцця ў працэсе вучобы, выхавання, а таксама заняткаў па выпраўленні дэфектаў развіцця і лячэбна-аздараўленчай работы. Прызначана забяспечыць адаптацыю і інтэграцыю дзяцей у грамадстве за кошт прафесійна-прац. падрыхтоўкі і інтэгравanага навучання ў адпаведнасці з узроставымі і індывід. асаблівасцямі іх разумовага і фіз. развіцця. Першыя Д.ш. ўзніклі ў Германіі і Францыі ў 1-й пал. 19 ст. У Беларусі адкрыты ў 1918—20 (у Віцебску, Магілёве, Мінску). Асн. тып Д.ш. — школы-інтэрнаты. Частка

В.Данчук. Сілуэты часу. 1977.

дзяцей вучыцца ў звычайных школах (інтэграванае навучанне), некат. атрымліваюць карэкцыйную дапамогу на дэфекталагічных пунктах і ў дыягностыка-рэабілітацыйных цэнтрах. Навучанне вядзецца па спец. вучэбных планах, праграмах і падручніках. Напаўняльнасць класаў каля 12 чал. Большасць выпускнікоў Д.ш. уключаюцца ў вытв. працу. Дзеці з цяжкай формай разумовай адсталасці знаходзяцца ва ўстановах Мін-ва сац. абароны (дамы-інтэрнаты псіханеўралагічнага профілю). Пед. кадры для Д.ш. са спец. сярэдняй адукацыяй рыхтуюць Салігорскае пед. вучылішча і Магілёўскі пед. каледж, з вышэйшай — Бел. пед. ун-т. Навукова-даследчую работу ў гэтым кірунку вядзе Нац. ін-т адукацыі. У 1996/97 навуч. г. ў Беларусі 49 Д.ш. *Т.Л.Ляшчынская.*

ДАПАМО́ЖНЫЯ ГІСТАРЫ́ЧНЫЯ ДЫСЦЫПЛІ́НЫ, гл. *Спецыяльныя гістарычныя навукі.*

ДАПАМО́ЖНЫЯ МО́ВЫ, штучныя знакавыя сістэмы, якія спецыяльна ствараюцца для камунікацыі ва ўмовах, калі сродкаў натуральных моў недастатковa ці карыстацца імі цяжка або немагчыма. Д.м. падзяляюцца на 2 асн. класы: міжнар. мовы-пасрэднiцы, або *штучныя мовы*, і *інфармацыйныя мовы.*

ДАПАСАВА́ННЕ ў м о в а з н а ў с т в е, падпарадкавальная сувязь, пры якой форма залежнага слова (кампанента) прыпадабняецца да формы галоўнага ў родзе, ліку і склоне. Грамат. паказчык Д. — канчатак; характэрная асаблівасць — змяненне формы асн. кампанента патрабуе адпаведных змяненняў у форме дапасаванага (напр., рыжы ліс, рыжага ліса і г.д). Адрозніваюць поўнае Д. (залежны кампанент цалкам дубліруе форму галоўнага і не мае самаст. грамат. значэння) і няпоўнае Д. (ахоплівае толькі асобныя формы галоўнага, напр., на станцыі «Маскоўская», з прафесарам Пятровай). *Т.Р.Рамза.*

ДАПАЎНЕ́ННЕ, даданы член сказа, які абазначае аб'ект і паясняе выказнік ці іншы член сказа. Падзяляюцца на прамыя [форма выражэння — вінавальны і родны (пры адмоўі і частковым ахопе прадмета дзеяння) склоны без прыназоўніка] і ўскосныя (інш. формы з прыназоўнікам і без яго). Напр.: «Паабедалі з бядою, спаражнілі місы. Абцёр бацька вус рукою, твар і лоб свой лысы» (Я.Колас) і «Пасварыліся за мех, а ў мяху смех».

ДАПАЎНЯ́ЛЬНАСЦІ ПРЫ́НЦЫП, метадалагічны прынцып, прапанаваны Н.*Борам* (1927) у сувязі з неабходнасцю стварэння лагічна несупярэчлівай фіз. інтэрпрэтацыі *квантавай механікі*; метадалагічнае абагульненне *неазначальнасцей суадносін.*

Мікраскапічныя аб'екты (электроны, фатоны і інш.) у розных эксперым. умовах могуць паводзіць сябе як строга лакалізаваныя часціцы ці як хвалі. Аднак уяўленне пра суіснаванне карпускулярных і хвалевых уласцівасцей у адным і тым жа аб'екце звязана з неабходнасцю аб'яднання несумяшчальных паняццяў (напр., паняцце даўжыні хвалі ў пэўным пункце прасторы не мае сэнсу). У адпаведнасці з Д.п. пры тэарэт. апісанні мікраскапічных з'яў неабходна ўжываць 2 сістэмы макраскапічных паняццяў, бо выкарыстанне адной з іх выключае магчымасць адначасовага выкарыстання другой; абедзве ж яны аднолькава неабходныя для поўнага апісання квантавамех. сістэм і з'яўляюцца нібыта ўзаемна дапаўняльнымі бакамі такога апісання. Бор прадэманстраваў таксама справядлівасць Д.п. ў дачыненні да апісання біял., псіхал. і сац. з'яў. З дапамогай Д.п. ўстанаўліваецца эквівалентнасць (раўназначнасць) паміж двума класамі паняццяў, што апісваюць супярэчлівыя сітуацыі ў розных сферах пазнання. У вузкім сэнсе Д.п. супадае з прынцыпам ням. фізіка В.Гайзенберга, які адзначаў, што пры пэўнасці каардынаты мікрачасціцы мае месца нявызначанасць імпульсу і наадварот. Часам Д.п. ацэньваецца як метадалогія, толькі знешне падобная на дыялектычную, або наогул як метафізічны падыход (мех. злучэнне процілегласцей). Фізікі капенгагенскай школы (П.Іордан, Дж.Франк) лічылі Д.п. чыста суб'ектыўным, цалкам абумоўленым слабасцямі пазнання, звязанымі з адсутнасцю спец. сродкаў адлюстравання цэласнасцей, вымушанасцю пазнання па частках.

Літ.: К р ы м с к и й С.Б., К у з н е ц о в В.И. Мировоззренческие категории в современном естествознании. Киев, 1983; Дополнительность и методология научного познания // Нильс Бор и наука XX в.: Сб. науч. тр. Киев, 1988; Мировоззренческие структуры в научном познании. Мн., 1993.

Л.М.Тамільчык, А.В.Ягораў.

ДАПРАФЕСІ́ЙНАЯ ПАДРЫХТО́ЎКА, агульнапрацоўная падрыхтоўка політэхн. і прафарыентацыйнага характару навучэнцаў агульнаадук. школ; базавы кампанент наступнага прафес. навучання. Мае на мэце садзейнічаць фарміраванню ўстойлівых арыентацый на прац. лад жыцця, маральна-псіхал. і ў пэўнай меры практычнай гатоўнасці да працы, выхаванню агульнай прац. культуры, развіццю творчых здольнасцей, інтэлектуальных і псіхафізіял. якасцей асобы. Будуецца на прынцыпах бесперапыннасці і пераемнасці, сумяшчэння навучання з працай, з'яўляецца важным сродкам прац. выхавання. Тэрмін «Д.п.» пашырыўся ў сувязі з рэкамендацыямі ЮНЕСКА і Міжнар. канферэнцыі працы (1965) па прафес.-тэхн. адукацыі і падрыхтоўцы, паводле якіх узровень прац. навучання ў агульнаадук. школах вызначаны як перадпрафесійны.

ДАПРЫЗЫ́ЎНАЯ ПАДРЫХТО́ЎКА, ваеннае навучанне моладзі дапрызыўнага ўзросту з мэтай падрыхтоўкі да службы ва ўзбр. сілах. Паводле Закону Рэспублікі Беларусь «Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе» ад 5.11.1992 уключае папярэдняе навучанне ваен.-тэхн. спецыяльнасцям, фіз. падрыхтоўку, лячэбна-аздараўленчую работу, ваен.-патрыят. выхаванне. Ажыццяўляецца ў адпаведнасці з праграмай, зацверджанай урадам. Д.п. праводзіцца і ў інш. краінах.

ДАПСА́НГ, адна з назваў самай высокай вяршыні Каракарума; гл. *Чагары.*

ДАРАВА́ЛЬНАЯ ГРА́МАТА, назва заканад. актаў аб наданні правоў і прывілеяў манастырам, прыватным асобам або групам насельніцтва, якія выдаваў правіцель Стараж. Русі і Рас. імперыі (вял. князь, цар, імператар) у 12—18 ст. Найб. значныя — Д.г. гарадам і дваранству (абедзве ўведзены 21.4.1785 Кацярынай II). «Грамата на правы і выгоды гарадам Расійскай імперыі» складалася з «Гарадавога» і «Рамеснага» палажэнняў; рэгулявала становішча гараджан (падзяляліся на 6 разрадаў, у т.л. купецтва і мяшчанства) і работу органаў гар. самакіравання (гл. *Гарадская дума*). На Беларусі ў гарадах, якія мелі *магдэбургскае права*, захоўваліся *магістраты*, у судаводстве выкарыстоўваўся *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588*; яўр. насельніцтва гарадоў падпарадкоўвалася *кагалу*. Асн. палажэнні Д.г. гарадам дзейнічалі да *гарадской рэформы 1870-х гадоў*. «Грамата на правы, вольнасці і прывілеі высакароднага расійскага дварянства» складалася з уводзін, 4 раздзелаў і 92 артыкулаў; пацвярджала асн. палажэнні *Маніфеста аб вольнасці дварянства 1762*, прадугледжвала захаванне элітнай ролі дваран у грамадстве, у т.л. недапушчэнне ў дваранскае саслоўе асоб з боку падатковага насельніцтва. Асобныя заканад. палажэнні Д.г. дзейнічалі да 1917.

Літ.: Российское законодательство X—XX вв. Т. 5. М., 1987.

ДАРАВА́ЛЬНЫ НАДЗЕ́Л, зямельны ўчастак, які паводле ўмоў *сялянскай рэформы 1861* у Расіі памешчык са згоды селяніна аддаваў яму ва ўласнасць без выкупу («дараваў»). Складаў $^1/_4$ вышэйшага надзелу, вызначанага рэформай для сялян пэўнай мясцовасці. Астатнія $^3/_4$ надзелу заставаліся за памешчыкам. Пераход б. прыгонных на Д.н. быў найб. пашыраны ў чарназёмных губернях Рас. імперыі. У Беларусі (у Магілёўскай і 8 паветах Віцебскай губ.) ён складаў 1—1,4 дзесяціны. У Зах. і Цэнтр. Беларусі мясц. «Палажэннем» ад 19.2.1861 ён зусім не прадугледжваўся. Д.н. быў недастатковы для вядзення гаспадаркі сялянамі, і яны вымушаны былі працаваць на памешчыка. У народзе Д.н. называлі «жабрацкім», «сірочым».

ДАРАГАБУ́Ж, назва ракі *Жыгулянка* ў ніжнім цячэнні.

ДАРАГА́НАВА, вёска ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Пціч; чыг. ст. на лініі Асіповічы—Слуцк. Цэнтр сельсавета. За 21 км на ПдЗ ад Асіповіч, 182 км ад Магілёва. 412 ж., 225 двароў (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, санаторная школа-інтэрнат, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Магілы ахвяр фа-

шызму. Каля вёскі стаянка бронзавага веку.

ДАРАДНІ́ЦЫН Анатоль Аляксеевіч (н. 2.12.1910, с. Башына Тульскай вобл., Расія), расійскі матэматык, геафізік і механік. Акад. АН СССР (1953), замежны чл. Балгарскай АН (1970). Герой Сац. Працы (1970). Скончыў Грозненскі нафтавы ін-т (1931). У 1945—55 у Матэм. ін-це імя У.А.Сцяклова. У 1955—89 дырэктар Выліч. цэнтра АН СССР, адначасова праф. Маскоўскага

А.А.**Дарадніцын**.

фіз.-тэхн. ін-та (з 1947). Навук. працы па праблемах дынамічнай метэаралогіі, аэрадынаміцы вял. скарасцей, прыкладной матэматыцы, нелінейнай механіцы, выліч. тэхніцы. Ленінская прэмія 1984; Дзярж. прэміі СССР 1946, 1947, 1951.

ДАРА́ДЧЫ ПАКО́Й у Рэспубліцы Беларусь і краінах СНД, ізаляванае памяшканне, у якім адбываецца нарада суда і дзе прымаецца рашэнне ці вызначэнне па разгледжанай справе; адна з гарантый незалежнасці суддзяў і тайны іх нарады перад вынясеннем прысуду. У час нарады ў Д.п. могуць знаходзіцца толькі суддзі, якія ўваходзяць у склад суда па дадзенай справе. Прысутнасць інш. асоб не дапускаецца. Суддзі не маюць права выдаваць меркаванні, якія мелі месца ў час нарады. Парушэнне тайны Д.п. з'яўляецца парушэннем закону і цягне адмену суд. пастановы. *Э.І.Кузьмянкова.*

ДАРА́НКА, рака ў Кіраўскім і Бабруйскім р-нах Магілёўскай вобл., правы прыток р. Ала (бас. Дняпра). Даўж. 20,5 км. Пачынаецца за 800 м на ПнУ ад в. Падрэчча Кіраўскага р-на. Рэчышча на ўсім працягу каналізаванае.

ДАРАПЕ́ЕВІЧЫ, вёска ў Чарнянскім с/с Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса. За 30 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Маларыта, 60 км ад Брэста, 439 ж., 175 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік ахвярам фашызму і помнік землякам. Помнік архітэктуры — царква Раства Багародзіцы (2-я пал. 17 ст.).

ДАРАСІНО́, вёска ў Любанскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 28 км на ПнЗ ад Любані, 145 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Урэчча. 655 ж., 279 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ДАРАСІ́НСКАЯ КЕРА́МІКА, ганчарныя вырабы майстроў з в. Дарасіно Любанскага р-на Мінскай вобл. Промысел вядомы з 18 ст., росквіту дасягнуў у канцы 19 — 1-й пал. 20 ст. Тут выраблялі кухонны, сталовы, тарны посуд з гліны светлага ці шэра-чорнага колеру, глазуравалі празрыстай ці зялёнай палівай. Формы вырабаў светлага ці светла-чырвонага колеру ўпрыгожвалі прамымі і хвалістымі выціснутымі або ангобнымі паяскамі. Бытаваў таксама чорназадымлены посуд. У 1930—40-я г. працавала ганчарная арцель, цяпер — ганчарны цэх (майстры М.Прышчэпа, М.Філіпеня, В.Юхневіч). Традыцыі Д.к. прадаўжаюць таксама ў ганчарнай майстэрні пры Любанскім раённым цэнтры культуры. *Я.М.Сахута.*

ДАРАФЕ́ЕЎ Гаўрыла, ліцейшчык 17 ст. з Полацка. У 1646 для Петрапаўлаўскай і Барысаглебскай цэркваў г. Пскоў (Расія) адліў звон, аздоблены арнаментамі і сцэнамі з Евангелля.

ДАРАШКЕ́ВІЧ Віктар Іванавіч (н. 9.6.1949, в. Сасновы Бор Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. літ.-знавец, крытык, тэкстолаг, перакладчык. Канд. філал. н. (1977). Скончыў БДУ (1971). У 1974—78, 1982—90 у Ін-це л-ры АН Беларусі, у 1978—82 вучоны сакратар Савета па каардынацыі навук. дзейнасці пры прэзідыуме АН Беларусі. Даследуе гісторыю стараж.-бел. л-ры, лацінамоўную л-ру Беларусі і Літвы 15—18 ст. (манаграфія «Новалацінская паэзія Беларусі і Літвы: Першая палавіна XVI ст.», 1979). Падрыхтаваў да друку паэму М.Гусоўскага «Песня пра зубра» (1980). Укладальнік зб-ка дакументаў і матэрыялаў «Францыск Скарына» (1988) і аўтар навук. каментарыя да яго.

ДАРАШКЕ́ВІЧ Іван Канстанцінавіч (1890, в. Меляшкі Беластоцкага ваяв., Польшча — 24.2.1943), бел. паэт. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1909). Настаўнічаў на Гродзеншчыне і каля Паневяжыса. Загінуў на фронце. З 1909 пад псеўд. Янук Д. і Каршун друкаваў у газ. «Наша ніва» вершы і допісы. Яго творчасць развівалася ў рэчышчы бел. рэв.-дэмакр. паэзіі, прасякнута суперажываннем чалавечаму гору, болем за лёс абяздоленых, патрыят. матывамі («Доля», «Стогн», «Псалм CXXXVI»). Інтымнай лірыцы паэта ўласцівы рамант. парыў, глыбіня пачуццяў («Як засвецяць у небе зоры»), часам элегічнасць («Шкада разбітых мар»).

Тв.: У кн.: Дзень паэзіі — 89. Мн., 1989.

А.С.Ліс.

ДАРАШКЕ́ВІЧ Юрый Альфрэдавіч (н. 11.1.1962, г. Асіповічы Магілёўскай вобл.), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1985). Аўтар размалёвак і вітражоў для радыётэхн. каледжа і суворaўскага вучылішча (абодва 1989) у Мінску. Працуе пераважна ў станковым жывапісе. Распрацоўвае тэмы «Бабы» і «Чашы»: «Чаша-аб'ект», «Чаша, знойдзеная ў лесе», «Чаша-вытока», «Чаша цёплая», «Чаша з прывідам» і інш. (усе 1990-я г.). У работах асобныя пластычныя вобразы ўключае ў вял. паліфанічную прастору, выкарыстоўваючы эфек-

Ю.**Дарашкевіч**. Чаша, знойдзеная ў лесе. 1994.

ты колерааптычныя, унутр. свячэння, піктаграмы, геаметрызм. Афарміў спектакль «Цудоўная дудка» ў Гродзенскім т-ры лялек (1988). *М.М.Пагранóўскі.*

ДАРАШКЕ́ВІЧ Яўген Адамавіч (н. 4.1.1935, в. Бабін Лес Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне парашковай металургіі. Д-р тэхн. н. (1985), праф. (1987). Скончыў БПІ (1963), дзе і працаваў. З 1980 у Бел. дзярж. навук.-вытв. канцэрне парашковай металургіі (з 1993 ген. дырэктар). Навук. працы па тэхналогіі матэрыялаў

Дарасінская кераміка.

на аснове метал. парашкоў. Распрацаваў тэорыю і тэхналогію пластычнага дэфармавання сітаватых парашковых матэрыялаў для вырабу высокатрывалых і высокадакладных дэталей; актываванага спякання парашковых матэрыялаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1987.

Тв.: Объемная штамповка порошковых материалов. Мн., 1993 (у сааўт.); Теория уплотнения порошковых материалов при нелинейно-вязком деформировании (разам з В.М.Гарохавым) // Порошковая металлургия. Мн., 1995. № 18.

ДАРАШЭ́ВІЦКІ ПАРК, помнік садова-паркавага мастацтва. Закладзены ў канцы 19 — пач. 20 ст. ў в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. на левым беразе р. Прыпяць. Парк пейзажнага тыпу. Пл. каля 8 га. Кампазіцыйным цэнтрам быў сядзібны дом (разбураны ў Вял. Айч. вайну).

Паркавы фасад дома быў арыентаваны ў бок ракі, перад ім — партэр у выглядзе эліпса. У парку раслі унікальныя для Беларусі экземпляры платана клёналістага, піхтаў сіб. і бальзамічнай (загінулі ў вайну). Захаваліся хвоя веймутава, елка чырвоная, дуб чырвоны і інш. *В.Р.Анціпаў.*

ДАРАШЭ́ВІЧ Міхаіл Васілевіч (19.11.1900, г. Орша Віцебскай вобл. — 28.1.1968), бел. дзярж. дзеяч, вучоны-геадэзіст. Праф. (1961). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1954). Скончыў БСГА (1927). З 1933 у БПІ; з 1947 рэктар. З 1959 міністр вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі БССР. Навук. працы па розных відах геад. здымак, камеральнай апрацоўцы палявых матэрыялаў, выяўленні і вывучэнні тарфяных радовішчаў.

ДАРАШЭ́ВІЧ Улас Міхайлавіч (17.1.1865, Масква — 22.2.1922), рускі журналіст, публіцыст, тэатр. крытык. Друкавацца пачаў ананімна з 1881 у газ. «Московский листок» (гумарыстычныя сцэнкі, рэпарцёрскія нататкі). З 1893 супрацоўнік газ. «Одесский листок». У 1902—18 рэдагаваў газ. «Русское слово». Майстар вострых, папулярных фельетонаў («кароль фельетона»), у якіх выкрываў царскіх міністраў, суд. сістэму, правінцыяльныя норавы. Аўтар рэаліст. нарысаў пра сахалінскую катаргу («Сахалін», ч. 1—2, 1903), тэатр. нарысаў і рэцэнзій пра артыстаў Ф.Шаляпіна, М.Ярмолаву, М.Савіну і інш. (кн. «Старая тэатральная Масква», 1923), нарысаў мемуарнага і літ.-крытычнага характару пра А.Чэхава, Л.Талстога, М.Горкага, У.Караленку, В.Верасаева і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—9. М., 1905—07; Золотая лихорадка. М., 1982; Сказки и легенды. Мн., 1983; Рассказы и очерки. М., 1986.

Літ.: Букчин С.В. Судьба фельетониста. Мн., 1975.

ДАРАШЭ́ВІЧ Фёдар Іванавіч (28.8.1905, г. Камянец Брэсцкай вобл. — 23.12.1986), бел. жывапісец. Скончыў Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе (1938). З 1938 выкладчык у маст. вучылішчы, у 1941—45 мастак агітмайстэрні ў Перме. З 1951 жыў у Мінску, у 1960—66 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це. Аўтар станковых твораў «Пасля працы» (1954), «Гарманіст ідзе» (1955), «Трывога» (1961), тэматычных карцін «Страляйце, не шкадуйце нас!» (1964), «1941 год» (1967), лірычных пейзажаў «Над Прыпяццю» (1973), «Возера Мураці» (1975) і інш. Стварыў шэраг партрэтаў.

Літ.: Масленікаў П. Мастак жыццёвасці і праўды // Мастацтва Беларусі. 1983. № 8.

ДАРАШЭ́ВІЧ Энгельс Канстанцінавіч (н. 26.10.1931, Мінск), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1984). Праф. (1992). Скончыў БДУ (1953). З 1958 у Ін-це філасофіі і права, з 1990 у Ін-це сацыялогіі АН Беларусі. Даследуе гісторыю эстэт. думкі, культуры, філасофіі, педагогікі Беларусі, міжнац. адносіны. Адзін з аўтараў навуч. дапаможнікаў для ВНУ па культуралогіі, этнасацыялогіі, этнапедагогіцы. Дзярж. прэмія БССР 1984

Ф.**Дарашэвіч**. Возера Мураці. 1975.

за ўдзел у напісанні цыкла работ па гісторыі філасофіі і грамадскай думкі Беларусі, апубл. ў 1973—80.

Тв.: Аниол Довгирд — мыслитель эпохи Просвещения. Мн., 1967; Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Мн., 1971; Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. М., 1972 (разам з У.М.Конанам); Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1985 (у сааўт.); Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986 (у сааўт.).

ДАРАШЭ́ВІЧЫ, геалагічнае агаленне паміж вёскамі Дарашэвічы і Кабакі Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.;

Геалагічнае агаленне **Дарашэвічы**.

помнік прыроды рэсп. значэння (з 1963). Пл. 3 тыс. м^2, ахоўная зона вакол 12 тыс. м^2. Размешчана на схіле 2-й надпоймавай тэрасы левага берага р. Прыпяць. У абрыве ракі агаляюцца магутныя адклады (больш за 2 м) торфу, якія ўтварыліся ў муравінскае міжледавікоўе 130—70 тыс. г. назад у вял. стараж. возеры. *В.Ф.Вінакураў.*

ДАРАШЭ́НКА Пётр Дарафеевіч (1627, г. Чыгірын, Украіна — 19.11.1698), гетман Правабярэжнай Украіны ў 1665—76. Рэестравы казак, ген. есаул (1663). У 1659 пасол у Маскве. Прыхільнік цэласнай і незалежнай Украіны, не прызнаваў умовы *Андросаўскага перамір'я 1667*. У 1669 ва ўмовах пагрозы ўварвання польск. і крымскіх войск пайшоў на саюз з Турцыяй. У 1676 капітуляваў перад рас. войскамі, у 1677 памілаваны рас. царом. У 1679—82 ваявода ў Вятцы, пазней жыў пад Масквой.

ДАРАШЭ́ЎСКІ (Doroszewski) Вітольд Ян (1.5.1899, Масква — 26.1.1976), польскі мовазнавец. Чл. АН у Кракаве (1947) і Польскай АН (1952). Д-р філал. н. (1928), праф. Варшаўскага ун-та (з 1930). Рэдактар час. «Poradnik Językowy» («Моўны дарадчык», з 1932). Даследаваў словаўтварэнне, фанетыку, дыялекталогію, семантыку польск. мовы: «Манаграфія пра словаўтварэнне» (ч. 1—4, 1928—31), «Асновы польскай граматыкі» (ч. 1, 1952), «Пра культуру слова» (ч. 1—3, 1962—79), «Элементы лексікалогіі і семіётыкі» (1970) і інш. У 1931—34 вывучаў бел. нар. гаворкі Палесся. Пытанні бел. мовы разглядаў у арт. «Роднасць моў у святле фактараў дыялекталогіі» (1939). Дзярж. прэмія Польшчы 1969.

Д'АРБІНЬ (D'Orbigny) Альсід Дэсалін (6.9.1802, г. Куэрон, Францыя — 30.6.1857), французскі палеантолаг, вучань Ж.*Кюўе*. У 1826—33 падарожнічаў па Паўд. Амерыцы. З 1853 праф. палеанталогіі Музея прыродазнаўчай гісторыі ў Парыжы. Апісаў больш за 100 тыс. выкапнёвых рэшткаў (малюскаў, ігласкурых і інш.). Развіваў *катастроф тэорыю* і сцвярджаў, што распаўсюджанне тых самых ці блізкіх формаў арганізмаў у розных па ўзросце геал. ярусах немагчыма. Прытрымліваўся ідэй *крэацыянізму*.

ДАРБІ́СТЫ, евангельскія хрысціяне дарбісты, плімуцкія браты, рэлігійная пратэстанцкая секта. Створана ў 1820—30-я г. ў г. Плімут (Англія) святаром Дж.Н.Дарбі (адсюль назва) як абшчына, апазіцыйная афіц. англіканскай царкве. Веравучэннем блізкія да *баптыстаў* і *евангельскіх хрысціян*. Вялі прапаганду сярод хрысціян і іудзеяў. Абраднасць больш спрошчаная. Д. поўнасцю адмаўляюць духавенства як асобную прафесійную групу і надаюць вял. значэнне асабістаму тлумачэнню Біблії. Найб. распаўсюджаны ў Англіі і яе б. калоніях і дамініёнах, Зах. Еўропе. У пач. 20 ст. з'явіліся ў Беларусі (Мінск). У 1920—30-я г. ў Зах.

Беларусі склаліся 3 цэнтры Д.: у Брэсце, Кобрыне, Пінску, якія праводзілі місіянерскую работу сярод мясц. сялян, а таксама яўрэяў. Пасля Вял. Айч. вайны дзейнасць секты заняпала.

Б.І.Камейша.

«ДАРБУДТЭ́ХНІКА», Беларускі дзяржаўны дарожны навукова-даследчы і праектна-тэхналагічны інстытут Навукова-вытворчага аб'яднання «Белаўтадарпрагрэс». Засн. ў 1962 на базе дарожна-доследнай станцыі як Белдар-НДІ. З 1992 «Дарбудтэхніка». Вядучая н.-д. арг-цыя Рэспублікі Беларусь у галіне буд-ва, рамонту і ўтрымання аўтадарог, мастоў і пуцеправодаў. Акрэдытаваны на тэхн. кампетэнтнасць і незалежнасць пры правядзенні выпрабаванняў, у т.л. сертыфікацыйных. Асн. кірункі дзейнасці: пошук і распрацоўка новых эфектыўных матэрыялаў, канструкцый, тэхнал. працэсаў, абсталявання і сродкаў механізацыі, эканомія і рацыянальнае выкарыстанне матэрыяльна-тэхн. і прац. рэсурсаў, павышэнне тэхн. ўзроўню, якасці дарожных работ і інш.

В.М.Яромка.

ДАРВА́ЗСКІ ХРЫБЕ́Т, у Зах. Паміры, паміж р. Абіхінгоу, Пяндж і Ванч, у Таджыкістане. Даўж. каля 200 км. Выш. да 6083 м (пік Арнавад). Складзены пераважна з гранітаў, метамарфічных сланцаў, кангламератаў. На схілах стэпавая і дрэвава-хмызняковая расліннасць. Ледавікі (пл. зледзянення каля 420 км^2).

ДАРВА́ЛЬ (Dorval; сапр. Дэланэ, Delauney) Мары (7.1.1798, г. Лар'ян, Францыя — 20.5.1849), французская актрыса. З сям'і правінцыяльных акцёраў. З дзяцінства выступала на сцэне. У 1818—34 у т-ры «Порт-Сен-Мартэн» (адзін з вядучых дэмакр. «тэатраў бульвараў» Парыжа). У 1834—38 у «*Камеды Франсэз*». Стварала вобразы шчырых, моцных жанчын, вымушаных адстойваць сваё права на шчасце. Сярод лепшых роляў: Амалія, Лючыя («Трыццаць гадоў, ці Жыццё гульца», «Ламермурская нявеста» В.Дзюканжа), Марыён Дэлорм (аднайм. п'еса В.Гюго), Адэль д'Эрвэ («Антоні» А.Дзюма-бацькі), Кіці Бэл («Чатэртан» А. дэ Віньі).

ДА́РВАШ (Darvas) Іожэф (8.2.1912, г. Орашхаза, Венгрыя — 3.12.1973), венгерскі пісьменнік. Належаў да дэмакр. плыні літ.-грамадскага руху «народных пісьменнікаў». У раманах «Чорны хлеб» (1934), «Ад хрышчэння да св. Сільвестра» (1935) адлюстраваў сац. барацьбу венг. сялянства. У гіст. рамане пра палкаводца Янаша Хуньядзі «Пераможца турак» (1938) падкрэсліў ролю народа ў супраціўленні іншаземным захопнікам. Раман «У верасні ён выйшаў у дарогу» (1940) і п'еса «Бездань» (1941) пра ўзаемаадносіны народа і інтэлігенцыі, драма «Неба ў куродыме» (1959) і раман «П'яны дождж» (1963; бел. пер. К.Кірэенкі, 1975) пра адказнасць чалавека за будучае сваёй краіны. Прэмія імя Кошута 1956 і 1960.

ДА́РВІН (Darwin) Чарлз Роберт (12.2.1809, г. Шрусберы, Вялікабрытанія — 19.4.1882), англійскі прыродазнавец, заснавальнік *дарвінізму*. Замежны чл.-кар. Пецярбургскай АН (1867). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1831). У 1831—36 на караблі «Бігль» прымаў удзел у кругасветным падарожжы, у час якога сабраў матэрыял па фауне і флоры, калекцыі невядомых выкапнёвых жывёл, геал. парод і мінералаў. У асн. навук. працы «Паходжанне відаў шляхам натуральнага адбору» (1859) абагульніў вынікі асабістых назіранняў, дасягненні біялогіі і селекцыйнай практыкі, выявіў асн. фактары эвалюцыі арган. свету. У працы «Змяненне свойскіх жывёл і культурных раслін» (т. 1—2, 1868) разглядаў дадатковы фактычны матэрыял да асн. працы. У кнізе «Паходжанне чалавека і палавы адбор» (1871) абгрунтаваў гіпотэзу паходжання чалавека ад малпападобнага продка. Навук. працы па геалогіі, батаніцы і заалогіі. Гл. таксама *Дарвіна прынцып класіфікацыі*.

ДА́РВІНА ПРЫ́НЦЫП КЛАСІФІКА́ЦЫІ, прынцып, паводле якога «чым менш якая-н. ч. арганізма звязана з якімі-н. асаблівымі функцыямі, тым больш яна мае значэнне для класіфікацыі». Напр., малюнак афарбоўкі ў птушак, жылак крыла насякомых, форма карэнных зубоў млекакормячых з'яўляюцца каштоўнымі крытэрыямі (адзнакамі) для класіфікацыі гэтых жывёл. Сфармуляваў Ч.*Дарвін* (1859).

ДАРВІНІ́ЗМ, матэрыялістычная тэорыя эвалюцыі арган. свету, заснаваная на поглядах Ч.*Дарвіна*. Абапіраецца на *зменлівасць, спадчыннасць* і *натуральны адбор*. На аснове зменлівасці ўтвараюцца новыя прыкметы і асаблівасці ў будове і функцыях арганізма, спадчыннасць замацоўвае гэтыя прыкметы, пад уздзеяннем натуральнага адбору выжываюць і размнажаюцца арганізмы, найб. прыстасаваныя да пэўных умоў існавання. Дзякуючы спадчыннай зменлівасці і бесперапыннаму дзеянню натуральнага адбору арганізмы ў працэсе эвалюцыі назапашваюць новыя прыстасавальныя прыкметы, што ў выніку вядзе да ўтварэння новых *відаў*. Д. далей развілі ў працах вучоныя 2-й пал. 19 — пач. 20 ст.: у Расіі — І.І.*Мечнікаў*, А.А.*Кавалеўскі*, У.А.*Кавалеўскі*, К.А.*Цімірязеў*, М.І.*Вавілаў*, І.І.*Шмальгаўзен* і інш.; у Вялікабрытаніі — Т.*Гекслі*, А.*Уолес*; у Германіі — Э.*Гекель*, Ф.Мюлер; у ЗША — А.Грэй і інш. Сучасны Д. уяўляе сабой сінтэз класічнага дарвінізму і эвалюцыйнай (або папуляцыйнай) генетыкі, што дазваляе глыбей пазнаць заканамернасці развіцця жывой прыроды і лепш выкарыстоўваць іх у с.-г. практыцы.

ДАРВІНІ́ЗМ САЦЫЯ́ЛЬНЫ, тэарэтычная плынь у грамадазнаўстве канца 19 — сярэдзіны 20 ст., якая імкнулася прычыны і кірункі грамадскага развіцця тлумачыць заканамернасцямі біял. эвалюцыі, прынцыпы прыроднага адбору, барацьбы за існаванне і выжыванне пераносіць на жыццё грамадства і чалавечых супольнасцей. Заснавальнік Д.с. англ. сацыёлаг Г.*Спенсер*. У межах Д.с. склаліся розныя кірункі. Прадстаўнікі антрапалагічнай школы ў сацыялогіі (Х.Чэмберлен, Ж.Лапуж, О.Аман) прынцыпы барацьбы за існаванне пераносілі непасрэдна на ўзаемаадносіны паміж сац. групамі, народамі, дзяржавамі. Польска-аўстр. сацыёлаг Л.Гумплавіч тлумачыў сац. з'явы з пазіцый натуралізму, а ўзаемаадносіны паміж сац. групамі трактаваў як бязлітасную барацьбу, якая вызначае не толькі сац. канфлікты, але і сац. жыццё ў цэлым. Г.Ратцэнгофер, У.Самнер, У.Беджат лічылі, што барацьба паміж расавымі, этн. і культ. групамі абумоўлена сутыкненнем інтарэсаў, якія з'яўляюцца ўвасабленнем біял. імкненняў. Прадстаўнікі сацыябіялогіі (Э.Уілсан, Р.Александэр, Р.Трыверс і інш.) выступаюць за новы сінтэз біял. і сац. навук, сцвярджаюць, што сфармуляваныя імі прынцыпы паводзін жывёл неабходна пашырыць на жыццё грамадства, бо гэта дасць магчымасць зразумець біял. асновы зыходных формаў чалавечых паводзін (сямейныя адносіны, сац. зносіны, сац. няроўнасць, агрэсія, альтруізм і інш.).

Я.М.Бабосаў.

ДА́РВІНСКІ ЗАПАВЕ́ДНІК, у Валагодскай і Яраслаўскай абл. Расіі, у межах Малога-Шэксінскай нізіны, на паўн.-зах. узбярэжжы і прыбярэжных мелкаводдзях Рыбінскага вадасх. Засн. ў 1945. Пл. 113 тыс. га, у т.л. 45 тыс. га акваторыі. Названы ў гонар Ч.*Дарвіна*. У межах Валагодскай вобл. ахоўная зона шыр. каля 2 км, агульнай пл. 17 тыс. га. Флора тыповая для падзоны паўд. тайгі; асн. тыпы расліннасці — лясы (каля 47 тыс. га) і балоты (больш за 17 тыс. га). Хваёвыя бары, сфагнавыя балоты; сярод 37 рэдкіх відаў вышэйшых раслін занесены ў Чырвоную кнігу Расіі: чаравік сапраўдны і надбароднік бязлісты, касач сібірскі з рэгіянальнага спіса рэдкіх і знікаючых відаў флоры Пн еўрап. ч. Расіі. У фауне 37 відаў млекакормячых (у т.л. буры мядзведзь, куніца, лось, дзік, гарнастай і інш.), 200 відаў птушак (глушэц, цецярук, рабчыкі, шэры журавель, вадаплаўныя і балотныя віды), нерасцілішчы каштоўных рыб (лешч, судак, лінь і інш.). З 1963 доследная ферма па вырошчванні глушцоў.

ДА́РВІШ, гл. *Дэрвіш*.

ДА́РВІШАЎ Віктар Андрэевіч (2.11.1897, г. Прылукі, Украіна — 12.10.1951), расійскі і бел. рэжысёр. Працаваў у т-рах Расіі. У 1933—38 маст. кіраўнік Бел. дзярж. драм. т-ра імя Я.Коласа (БДТ-2). Імкнуўся спалучаць у творчасці т-ра тагачасную сав. драма-

тургію з нац. драматургіяй і рус. класікай. Сярод пастановак у БДТ-2: «Байцы» Б.Рамашова (1934), «Любоў Яравая» К.Транёва, «Беспасажніца» А.Астроўскага, «Вайна вайне» і «У пушчах Палесся» Я.Коласа (1937).

ДАРГАМЫ́ЖСКІ Аляксандр Сяргеевіч (17.2.1813, с. Троіцкае Тульскай вобл., Расія — 17.1.1869), рускі кампазітар;

А.С.Даргамыжскі.

адзін з заснавальнікаў рус. класічнай муз. школы (разам з М.*Глінкам*). Атрымаў рознабаковую (у т.л. муз.) хатнюю адукацыю. Паслядоўнік Глінкі, самабытна развіваў яго традыцыі. Верны асн. прынцыпам народнасці, нац. характэрнасці музыкі, Д. праклаў новыя шляхі ў рус. муз. мастацтве, абнавіў прыёмы і сродкі муз. выразнасці. Яго найб. вядомы твор — опера «Русалка» (1856) знаменавала нараджэнне новага жанру — нар.-бытавой псіхал. муз. драмы. На аснове меладызаванага рэчытатыву, блізкага да жывых інтанацый гаворкі, стварыў тып рэчытатыўнай оперы («Каменны госць» на тэкст А.Пушкіна; скончана Ц.Кюі і М.Рымскім-Корсакавым, 1872). Д. ўпершыню ўвасобіў у музыцы тэму сац. няроўнасці, узбагаціў жанры вак. лірыкі: раманcы «Я вас любіў», «Вяселле», «Начны зефір», «І сумна, і нудна», песня «Млынар», драм. песня «Стары капрал», сатыр.-камічныя песні «Чарвяк», «Тытулярны саветнік». З інш. твораў: опера «Эсмеральда» (1847), опера-балет «Трыумф Вакха» (1848); для аркестра: жарт-фантазія «Баба-яга, або З Волгі nach Riga» (1862), «Маларасійскі казачок» (1864), «Чухонская фантазія» (1867). Д. акрэсліў новыя шляхі ў оперным і камерна-вак. жанрах, якія вядуць да творчасці М.Мусаргскага, П.Чайкоўскага і інш. рус. кампазітараў.

Літ. тв.: Избр. письма. Вып. 1. М., 1952.

Літ.: Пекелис М. Даргомыжский и народная песня. М.; Л., 1951; Ягож. А.С.Даргомыжский и его окружение. Т. 1—3. М., 1966—83; Скудина Г. Даргомыжский — восхождение к правде // Муз. жизнь. 1984. № 5. *Н.М.Юдзеніч.*

ДАРДАНЕ́ЛЫ (Dardanelles), тур. Чанакале-Багазы, стараж.-грэч. Гелеспонт), праліў паміж Еўропай (Балканскі п-аў) і Азіяй (п-аў М.Азія). Злучае Эгейскае м. з Мармуровым м. Даўж. 120 км, шыр. 1,3—27 км, глыб. на фарватэры 29—153 м. Парты Гелібалу, Чанакале (Турцыя). Пра міжнар. прававы рэжым Д. гл. ў арт. *Чарнаморскія пралівы.*

ДАРДО́НЬ (Dordogne), рака на ПдЗ Францыі, правы прыток Гароны, з якой утварае агульнае вусце — эстуарый Жыронда. Даўж. 472 км, пл. бас. 23,4 тыс. км^2. Вытокі на Пн масіву Мон-Дор, верхняе і сярэдняе цячэнне — па Цэнтр. Французскім масіве, ніжняе — па Гаронскай нізіне. Асн. прытокі — рэкі Везер і Іль. Сярэдні расход вады 405 м^3/с. У ніжнім цячэнні марскія прылівы. Каскад ГЭС. На Д. — гарады Бержэрак, Лібурн (пач. суднаходства).

ДАР'Е́НСКІ ЗАЛІ́Ў (Golfo del Darien), заліў на ПдЗ Карыбскага м., каля берагоў Калумбіі і Панамы. Даўж. 165 км, глыб. ад 70 м (каля ўзбярэжжа) да 1200—2000 м (у адкрытай частцы). Прылівы няправільныя паўсутачныя (да 0,6 м). Паўд. вузкая частка Д.з., якая ўдаецца ў сушу на 100 км, наз. залівам Ураба.

ДАРКЕ́ВІЧ Пётр Яўгенавіч (1898, в. Міхалава Смаленскай вобл., Расія — 4.11.1937), бел. гісторык мастацтва. Брат Х.Я.*Даркевіча*. Скончыў Маск. ун-т. Выкладаў у Віцебску ў маст. тэхнікуме (1927—37), кінатэхнікуме (1932—37), пед. ін-це. Даследаваў праблемы тэорыі і гісторыі мастацтва. Рэпрэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны 6.9.1957.

Тв.: Да пытання аб праблеме мастацкага стылю // Польмя. 1929. № 11—12. *А.Г.Лісаў.*

ДАРКЕ́ВІЧ Хрыстафор Яўгенавіч (1900, в. Міхалава Смаленскай вобл., Расія — 4.11.1937), бел. мастак. Брат П.Я.*Даркевіча*. Вучыўся ў Пецярб. вышэйшым маст.-тэхн. ін-це (1921—26). У 1920-я г. выкладаў у сярэдніх школах Ленінграда, з 1931 — у Віцебскім маст. тэхнікуме. Працаваў у манум. і станковым жывапісе. Аўтар пейзажаў «Восень» (1932), «Саўгас «Сасноўка» (1934), «Над ракой» (1936), партрэты А.Стаханава, Я.Купалы, А.Александровіча, А.Пушкіна, М.Горкага, карцін «Малацьба ў саўгасе» (1936) і інш.; фрэсак на будынку вакзала станцыі Сіроціна Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. (1930-я г.). Рэпрэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны 12.3.1961.

Літ.: Сімановіч Д. Фрэскі на старой сцяне // ЛіМ. 1989. 22 верас. *А.Г.Лісаў.*

ДАРКЛЕ́ (Darclée; сапр. Харыклі-Хартуларыс; Haricliy Hartulari) Харыклея (10.6.1860, г. Брэіла, Румынія — 10.1.1939), румынская спявачка (лірыка-драм. сапрана). Музыцы вучылася ў Вене, Бухарэсце, удасканальвалася ў Парыжы. У 1888 дэбютавала ў т-ры «Гранд-Апера» (Парыж) у партыі Маргарыты («Фауст»), падрыхтаванай пад кіраўніцтвам Ш.Гуно. Гастраліравала ў многіх краінах. Валодала моцным прыгожым голасам мяккага тэмбру, дасканалай тэхнікай, яркім сцэн. дараваннем. Дыяпазон яе голасу дазваляў выконваць партыі лірыка-каларатурнага і мецца-сапрана: Дэздэмона, Віялета (*«Атэла»*, *«Травіята»* Дж.Вердзі), Эль (*«Лаэнгрын»* Р.Вагнера), Неда (*«Пацы»* Р.Леанкавала), Мімі, Тоска, выканая ўпершыню (*«Багема»*, *«Тоск* Дж.Пучыні), Валянціна (*«Гугенот* Дж.Меербера), а таксама напісаныя д яе гал. партыі ў операх Леанкава (*«Заза»*), П.Масканьі (*«Ірыс»*), А.Кат лані (*«Валі»*).

ДА́РЛІНГ (Darling), горны хрыбет ПдЗ Аўстраліі. Даўж. каля 300 км. Вы да 582 м (г. Кук). Уяўляе сабой моц расчлянёны эрозіяй край Зах.-Аўстра пласкагор'я, што стромка абрываец да прыморскай нізіны. На вільготн зах. схілах эўкаліптавыя лясы, якія раўнінах пераходзяць у рэдкалессе.

ДА́РЛІНГ (Darling), рака на ПдУ А стралії, правы прыток Мурэя. У верхн цячэнні, да сутокаў з р. Калгаа, пасл доўна наз.: Думерэк, Макінтайр і Бар ан. Даўж. 2740 км, пл. бас. 650 тыс. км Пачынаецца на зах. схілах хр. Нью-І

Х.Даркле.

гленд (сістэма Вял. Водападзельна хр.), у ніжнім цячэнні працякае па па пустыні. Сярэдні гадавы расход вады м^3/с. Жыўленне дажджавое. Рэжым п водкавы, ваганні ўзроўню вады да 6— м. У сухі перыяд года ў нізоўі перас хае, распадаецца на плёсы. Выкары тоўваецца для арашэння.

ДАРЛІНГТО́НІЯ (Darlingtonia califo піса), кветкавая насякомаедная расліна сям. сарацэніевых. Пашырана ў Паў Амерыцы (ад паўн. Каліфорніі да паў Арэгона). Расце на балоцістых глебах.

Шматгадовая травяністая расліна з карэн шчам і разеткай своеасаблівых гарлачыкап добных лістоў-пастак даўж. да 1 м. Квет адзіночныя, пялёсткі жаўтаватыя з чырван ватымі жылкамі. Плод — каробачка. Па кр ліста — цёмна-чырв. раздвоены лістападобн прыдатак. На ўнутр. паверхні ліст мае зало кі, якія выдзяляюць нектар, што прываблів насякомых. Сценкі лістоў-пастак укрыты в

аскамі, якія дазваляюць насякомым рухацца олькі ўнутр ліста, дзе яны гінуць у вадкасці, ито выдзяляе расліна. *Г.У.Вынаеў.*

ДАРЛІЯ́К Ніна Львоўна (н. 7.8.1908, С.-Пецярбург), спявачка (сапрана) і пе-агог. Нар. арт. Расіі (1979). Нар. арт. СССР (1990). Скончыла Маскоўскую ансерваторыю (1932; клас К.Дарліяк, аці Д.), з 1935 выкладала ў ёй, стварыа школу камерных спеваў (праф. з 947). Адна з буйнейшых сучасных ка-ерных спявачак. З 1935 выступала ў анцэртах, у т.л. ў ансамблі з мужам — С.*Рыхтэрам.* Выконвала рамансы і перныя арыі рус. і замежнай класікі, ак. лірыку сучасных кампазітараў, у л. ўпершыню шэраг твораў С.Пра-оф'ева, Дз.Шастаковіча і інш. Сярод учаніц Г.Пісарэнка, Т.Тугарынава, .*Ільіна.*

А́РМШТАТ (Darmstadt), горад у энтр. ч. Германіі, зямля Гесен. Вядо-ы з 11 ст. 139,8 тыс. ж. (1994). Вузел ыгунак і аўтадарог. Прам-сць: маш.-уд. (вытв-сць паліграф. машын, рухаві-оў, радыё- і тэлеапаратуры, эл.-тэхн.), м., папяровая, гарбарна-абутковая, аліграф., мэблевая. Вытв-сць шпале-аў. Ням.-польскі ін-т (з 1980). Музеі. рх. помнікі: царква (15 ст.), замак 6—18 ст.) з царквой (16 ст.), ратуша 6 ст.).

АРНАВА́ННЕ (ад ням. Dorn метал. ып, дорн), 1) утварэнне адтуліны прашыванне») у нагрэтым злітку для рымання загатоўкі трубы. 2) Апрацоў-а адтулін (каліброўка) для павышэння акладнасці іх формы і памеру, памян-эння шурпатасці і ўмацавання павер-невага слоя. Робіцца ратацыйным дор-ам на такарных, расточных і інш. анках. Асн. элемент ратацыйнага дор-а — шарыкі (або ролікі) з загартава-ай сталі, якія пры абкочванні беспера-ынна прыціскаюцца да паверхні, што працоўваецца. На Беларусі комплекс атацыйных дорнаў створаны пад кіраў-цтвам Я.Р.*Канавалава* (Залаты медаль а Лейпцыгскім кірмашы ў 1967).

АРО́ГА, спецыяльна падрыхтаваная аласа на зямной паверхні, надземнае бо падземнае збудаванне для перамя-чэння трансп. і інш. тэхн. сродкаў, одзей, грузаў. Адрозніваюць Д.: бяз-йкавыя (*аўтамабільныя дарогі*, трак-рныя, веласіпедныя, для *гужавога ранспарту*, прагону жывёлы, падвес-ыя *канатныя дарогі* і інш.); рэйкавыя аземныя (*чыгунка*), падземныя (*метра-літэн*), навясныя або падвесныя *ма-рэйкавыя дарогі*, наземныя канатныя ля перамяшчэння ваганетак з грузам а вузкакалейных пуцях з дапамогай анатнай цягі). На Д. будуюць *масты, унэлі, пуцеправоды*, ставяць агароджы, *акі дарожныя* і інш. сродкі тэлекаму-кацый.

Сетка Д. (звычайна без пакрыццяў) пачала ладвацца ў Еўразіі ў 5-м тыс. да н.э. Хеты і ірыйцы будавалі Д. значнай працягласці, ста з каменнымі пакрыццямі. У Стараж. ме ў канцы 4 ст. да н.э. пабудавана пер-ая брукаваная *Апіева дарога.* З 2 ст. да н.э. наладжаны караванны *Вялікі шаўковы шлях* з Кітая ў краіны Сярэдняй і Пярэдняй Азіі. На тэр. Беларусі сетка грунтавых Д. пачала складвацца ў 7—9 ст. З 9 ст. наладжаны водны *шлях з «варагаў у грэкі»* з выкарыстаннем паміж рэкамі прасцейшых сухапутных Д. З 11—12 ст. паступова будуецца і набывае значэнне Д. Масква—Смаленск—Мінск—Брэст (наз. «Вялікая Смаленская», або «Пасольская»). Пашырыліся паштовыя дарогі са станцыямі, корчмамі, мытнямі, ямской службай. У 19 ст. праз Беларусь пракладзены 2 важнейшыя шашэйныя Д. Расійскай імперыі — Масква—Варшава і Санкт-Пецярбург—Кіеў. У пач. 19 ст. вынайдзена *дарожнае адзенне* з суцэльнага слоя ўтрамбаванага друзу, што выклікала інтэнсіўнае буд-ва ва ўсіх краінах Д. з цвёрдым (пераважна друзавым) пакрыццём. Са з'яўленнем аўтамабіляў пачалося буд-ва Д. з асфальтавым пакрыццём. Развіццё дарожнага буд-ва стымулявала стварэнне спец. *дарожных машын*, вытв-сць *дарожна-будаўнічых матэрыялаў*, распрацоўку тэхналогій *дарожна-будаўнічых работ.* *І.І.Леановіч.*

ДАРО́ГІ, мястэчка, да 1791 назва горада *Старыя Дарогі.*

Дарлінгтонія каліфарнійская.

ДАРО́ЖКА, снасць для лоўлі драпежнай рыбы. Прадаўгаватая металічная пласціна з кручком або якарком на канцы, прымацаваная да доўгага шнура, што цягнуць за чаўном ці лодкай. Кручок (якарок) маскіруюць чырвонымі ніткамі ці тканінай. Шнур намотваюць на спец. калаўроцік (матавільца) або дошчачку. Д. вядома на Беларусі са старажытнасці, у наш час выкарыстоўваецца рыбаловамі-аматарамі. *І.М.Браім.*

Да арт. **Дарога**. Дарожны вузел (развязка) з мостам цераз раку.

«ДАРО́ЖКА», бел. нар. масавы танец, блізкі да *карагода.* Выяўлены ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл. У аснове харэаграфічнай кампазіцыі прамыя лініі з перастраеннямі. Памер 2-дольны, тэмп умераны. Сцэнічны варыянт створаны ў канцы 1940-х г. балетмайстрам Я.Хацілоўскім (паст. самадз. танц. ансамблем у Смаргоні). *Л.К.Алексютовіч.*

М.А.**Дарожкін**.

Н.М.**Дарожкін**.

ДАРО́ЖКІН Мікалай Апанасавіч (14.12.1905, в. Гарохаўка Бранскай вобл., Расія — 27.4.1993), бел. вучоны-міколаг і фітапатолаг. Акад. АН Беларусі (1962, чл.-кар. 1950), Акадэміі с.-г. н. (1959—61), д-р с.-г. н. (1934), праф. (1933). Засл. дз. нав. Беларусі (1965). Скончыў БСГА (1927). З 1948 дырэктар Ін-та біялогіі АН Беларусі, з 1959 дырэктар Бел. НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва, заг. лабараторыі імунітэту, у 1976—77 заг. лабараторыі ніжэйшых раслін Ін-та эксперым. батанікі АН Беларусі. Навук. працы па вывучэнні біялогіі і відавога складу ўзбуджальнікаў вірусных хвароб збожжавых і бабовых культур, бульбы, таматаў і інш., агратэхн. метадах барацьбы з узбуджальнікамі раку бульбы, яе хваробамі і шкоднікамі. Адзін з аўтараў сартоў бульбы Лошыцкі, Кандыдат, Агеньчык, Тэмп, Беларускі ранні, Паўлінка і інш. Дзярж. прэмія СССР 1974.

Тв.: Фитофтороз картофеля и томатов. Мн., 1976 (у сааўт.); Болезни бобовых культур. Мн., 1978 (у сааўт.); Болезни картофеля. Мн., 1979 (разам з С.І.Бельскай).

ДАРО́ЖКІН Ніл Мікалаевіч (н. 26.2.1927, г. Бранск, Расія), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі парашковых матэрыялаў. Чл.-кар. АН Беларусі (1986), д-р тэхн. н. (1977), праф. (1979). Сын М.А.*Дарожкіна.* Скончыў Ленінградскі ваенна-мех. ін-т (1952). З 1955 у БПІ, з 1959 у Фіз.-тэхн. ін-це Нац. АН Беларусі. У 1963—71 у ЦНДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны СССР (Мінск). З 1971 у Ін-це цепла- і масаабмену Нац. АН Беларусі. Навук. працы па фіз.-тэхн. асновах стварэння ахоўных пакрыццяў, распрацоўцы абсталявання

і матэрыялаў для прыпякання іх на паверхнях дэталей машын.

Тв.: Упрочнение и восстановление деталей машин металлическими порошками. Мн., 1975; Центробежное припекание порошковых покрытий при переменных силовых воздействиях. Мн., 1993 (у сааўт.).

ДАРО́ЖНА-БУДАЎНІ́ЧЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ, будаўнічыя матэрыялы (вырабы), якія выкарыстоўваюцца пры буд-ве *аўтамабільных дарог*, пакрыццяў вуліц і плошчаў. Падзяляюцца на грунтавыя (*гліны, суглінкі, пяскі, супескі*), каменныя прыродныя (*жвір, бутавы камень, друз, брусчатка* і інш.) і штучныя (*асфальтабетон*, цэментны і палімербетон і інш.), керамічныя (*клінкер*, тратуарныя пліткі, цагляны друз, трубы для дрэнажу), шлакавыя (шлакавы друз, адлітыя з шлакавага расплаву камяні і пліты), арган. і мінер. вяжучыя рэчывы (*бітум, дзёгаць, гудрон, смолы, пакосты; цэмент, вапна, гіпс*), *бетоны* і вырабы з іх, палімерныя матэрыялы (ідуць пераважна на плёнкаўтваральныя ахоўныя пакрыцці і ўмацавальныя дабаўкі да грунтоў). Гл. таксама *Будаўнічыя матэрыялаў прамысловасць*.

Да арт. **Дарожна-будаўнічыя работы**. Будаўніцтва цэментна-бетоннага дарожнага пакрыцця (укладка сумесі на падрыхтаванае земляное палатно).

Да арт. **Дарожна-будаўнічыя работы**. Укладка ахоўнага слоя дарожнага пакрыцця (размеркаванне друзу па слоі бітуму).



Дарожнае адзенне: 1 — дадатковы слой асновы; 2, 3 — слаі асновы; 4, 5 — ніжні і верхні слаі дарожнага пакрыцця.

ДАРО́ЖНА-БУДАЎНІ́ЧЫЯ РАБО́ТЫ, комплекс работ па будаванні *аўтамабільных дарог*, пакрыццяў вуліц, плошчаў і інш. аб'ектаў дарожна-трансп. прызначэння. Падзяляюцца на падрыхтоўчыя, асноўныя, дапаможныя і заключныя.

Падрыхтоўчыя работы — расчыстка дарожнай паласы, уладкаванне пад'ездаў, буд. пляцовак, часовых вытв. і інш. збудаванняў; асноўныя работы — нарыхтоўчыя (здабыча ў *кар'ерах* і апрацоўка каменных і інш. *дарожна-будаўнічых матэрыялаў*, выраб на спецыялізаваных прадпрыемствах бетоннай сумесі, дарожных пліт, труб, маставых канструкцый і інш.) і буд.-мантажныя (узвядзенне *земляного палатна*, укладка *дарожнага адзення*, буд-ва *тунэляў, пуцеправодаў, мастоў*, інж. ўладкаванне дарогі, установка *знакаў дарожных*, агароджы і інш.); дапаможныя работы — *мантаж* і дэмантаж тэхнал. установак, перанос ліній сувязі і інш.; заключныя работы — *рэкультывацыя зямель*, ліквідацыя часовых пабудоў, выдаленне буд. адходаў і смецця. Адрозніваюць таксама лінейныя работы (з раўнамерным размеркаваннем аб'ёмаў работ па трасе дарогі) і сканцэнтраваныя (напр., буд-ва трансп. развязак, мастоў, будынкаў); *земляныя работы, бетонныя работы*, грунтаўмацавальныя, гідраізаляцыйныя і інш. Механізацыя Д.-б.р. забяспечваецца выкарыстаннем агульнабуд. (гл. *Будаўнічыя машыны*) і дарожна-буд. машын (гл. *Дарожныя машыны*).

Літ.: Технология и организация строительства автомобильных дорог. М., 1992.

І.І.Леановіч.

ДАРО́ЖНАЕ АДЗЕ́ННЕ, шматслойная канструкцыя праезнай ч. *аўтамабільнай дарогі*, прызначаная стварыць роўную, трывалую і шурпатую паверхню для руху трансп. сродкаў. Успрымае нагрузку ад колаў машын, перадае яе ў разгрупаваным выглядзе на *земляное палатно*, ахоўвае яго ад увільгатнення і прамярзання.

Д.а. складаецца з дарожнага пакрыцця і адна- або шматслойнай асновы. Дарожнае пакрыццё бывае ўдасканаленае капітальнае (цэмента- або асфальтабетоннае, мазаічнае і брусчатае маставое на трывалай аснове), удасканаленае аблегчанае (чорнае друзавае і чорнае жвіровае на аснове з каменных матэрыялаў), пераходнае (грунтадрузавае, грунтажвіровае і грунтавое, умацаванае вяжучымі матэрыяламі, маставое з колатага каменю), ніжэйшае (грунтавое, палепшанае дамешкамі жвіру, друзу або пабудаванае з аптымальных грунтавых сумесей). Аснову адзення робяць з цэмента- і асфальтабетону, шчэбеню, гравію, з грунтоў, умацаваных вяжучымі рэчывамі і інш. Можа мець гідра- або цепла-ізаляцыйныя праслойкі, трубчасты дрэнаж. У Беларусі дарогі агульнага карыстання маюць Д.а. (1997, у %): цэментабетоннае 3,5, асфальтабетоннае 63,5, чорнае жвіровае і чорную шашу 3, белую шашу 0,1, маставое 0,5, жвіровае 29,4.

І.І.Леановіч.

ДАРО́ЖНЫ (сапр. Серада) Сяргей Міхайлавіч (25.2.1909, г. Слонім Гродзенскай вобл. — 19.7.1943), бел. паэт. Скончыў БДУ (1930). Працаваў на гуце ў Барысаве, у рэдакцыях газет і часопісаў. У 1936 рэпрэсіраваны. Пакаранне адбываў на Д. Усходзе, будаваў Камсамольск-на-Амуры. Там і загінуў. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся з 1925. Аўтар зб. вершаў «Звон вясны» (1926, з І.Плаўнікам), «Васільковы россып» (1929), «Пракосы на памяць» (1932). Узнёсла-рамантычна славіў сацыялістычнае буд-ва, пісаў пра рэв. барацьбу працоўных Зах. Беларусі, паэтызаваў родную прыроду. Паэзія Д. вылучаецца спавядальнай шчырасцю, свежасцю метафарычнай вобразнай фактуры, мілагучнасцю радка. У некат. вершах адчуваецца ўплыў паэтыкі У.Дубоўкі. Пераклаў на бел. мову раман Г.Караваевай «Лесазавод», вершы Э.Багрыцкага, С.Кірсанава, А.Твардоўскага, І.Уткіна, І.Харыка і інш., апавяданні У.Караленкі, А.Новікава-Прыбоя і інш.

С.Дарожны.

Тв.: Выбр. вершы. Мн., 1966.

Літ.: Надняманскія былі. Мн., 1968. С. 39—41; Шушкевіч С. Ён песню насіў у грудзях... // Шушкевіч С. Выбр. тв. Мн., 1978. Т. 2.

І.У.Саламевіч

ДАРО́ЖНЫ ПРАСВЕ́Т, клірэнс, адлегласць ад найніжэйшага элемента канструкцыі аўтамабіля (акрамя колаў) да ўзроўню зямлі (апорнай плоскасці). Д.п. легкавых аўтамабіляў 170—210 мм, аўтобусаў 180—340 мм, грузавых аўтамабіляў 220—540 мм.

ДАРО́ЖНЫЯ ВО́ЙСКІ, спецыяльныя войскі, прызначаныя для выканання задач дарожнага забеспячэння. Складаюцца з дарожна-каменданцкіх, дарожна-буд., мостабуд. і інш. часцей і падраздзяленняў; забяспечваюцца тэхнічнымі сродкамі для ўзнаўлення разбураных участкаў аўтадарог, мастоў, а таксама спец. абсталяваннем і транспартам для забеспячэння руху. У рус. арміі з'явіліся ў пач. 18 ст., у Сав. Узбр. Сілах — у часы Вял. Айч. вайны.

ДАРО́ЖНЫЯ ВО́СЫ (Pompilidae), сямейства вос падатр. сцябліністабрухіх перапончатакрылых насякомых. Больш за 3 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках. На Беларусі 24 віды, з іх сярод камянёў і раслін на пясчаных дарогах найб. трапляюцца пампілы дарожны (Pompilus viaticus), павукалоў буры (Priocnemis fuscus).

Даўж. 3—25 мм. Пярэдняспінка развітая, брушка кароткае, сцябліністае. Малюнак цела чорны або чорны з чырвоным ці жоўтым. Ногі доўгія, пярэднія часта з капальным грэбенем. Палююць на павукоў. Большасць з

рые ў зямлі гнёзды, выкарыстоўваюць і норкі павукоў, куды адкладваюць яйцы на паралізаваных уколамі джала павукоў, якія з'ўляюцца кормам для лічынак. Лічынка акукліваецца ў норцы.

ДАРО́ЖНЫЯ ЗНА́КІ, гл. *Знакі дарожныя.*

ДАРО́ЖНЫЯ МАШЫ́НЫ, комплекс машын і агрэгатаў для выканання *дарожна-будаўнічых работ*, рамонту і ўтрымання аўтамаб. дарог, пакрыццяў вуліц і плошчаў. Шырока выкарыстоўваюцца таксама ў гідратэхн., прамысл., с.-г., гар., аэрадромным буд-ве і на інш. інж.-буд. работах. Бываюць самаходныя, навясныя і прычапныя (да *трактароў, цягачоў*, аўтамабіляў).

Д.м. для падрыхтоўчых работ — *карчавальнікі, кустарэзы, каменеўборачныя машыны, рыхліцелі*, дрэвавалы, дзернарэзы; імі ачышчаюць дарожныя палосы ад хмызняку, валуноў, раслінага слоя, рыхляць грунт. Д.м. для земляных работ — *бульдозеры, грэйдэры, грэйдэры-элеватары, канвееры, каналакапальнікі, скрэперы, экскаватары, самазвалы*, грунтакідальнікі і інш. (гл. таксама *Землярыйныя машыны*). Выконваюць работы па адсыпцы насыпаў, распрацоўцы выемак, пракладцы водаадводных канаў, узвядзенні штучных збудаванняў, транспартаванні грунту. Д.м. для ўшчыльнення грунту і пакрыццяў — *каткі дарожныя, трамбавальныя машыны*, вібраплиты і інш. (гл. ў арт. *Вібрацыйная тэхніка*. Д.м. для ўкладкі дарожнага адзення і пакрыцця — *бетанавозы, бітумавозы, гудранатары, асфальтабетонаўкладчыкі, бетонаўкладчыкі, фрэзы дарожныя, планіроўшчыкі*, грунтазмяшальныя машыны і ўстаноўкі і інш. Д.м. для дарожна-эксплуатацыйных работ — *снегаўборачныя машыны*, паліваль-на-мыечныя, аўтараманцёры, разметачныя, піска- і солераскідвальнікі, падмятальна-ўборачныя і інш. (гл. ў арт. *Камунальныя машыны*). Ёсць машыны для падрыхтоўкі, нарыхтоўкі, транспартавання дарожна-буд. матэрыялаў (*драбілкі, дазатары, грохаты, каменерэзныя машыны, бетоназмяшальнікі, пагрузчыкі, падзёмныя краны* і інш.).

У Беларусі работы па стварэнні Д.м. вядуць НВА «Белдарбудтэхніка», канцэрн «Амкадор», Магілёўскі аўтамаб. з-д, Мазырскі з-д меліярац. машын, БПА, Магілёўскі машынабуд. ін-т і інш.

Літ.: Машины для строительства дорог. 2 изд. М., 1971; Дорожные машины. 2 изд. Л., 1976. *І.І.Леановіч.*

ДАРО́НІКУМ (Doronicum), род кветкавых раслін сям. астравых. Каля 35 відаў. Пашыраны ў гарах умераных паясоў Еўропы, Азіі, Паўн. Афрыкі. На Беларусі інтрадукаваны і вырошчваюцца ў садах, парках і на прысядзібных участках 2 віды: Д. усходні (D. orientale) і трыпутнікавы (D. plantagineum).

Шматгадовыя травяністыя расліны з карэнішчам і прамастойнымі простымі або слабагалінастымі сцябламі. Прыкаранёвае лісце яйцападобна-круглаватае, з доўгімі чаранкамі, сцябловае — яйцападобна-эліпсоіднае. Кветкавыя кошыкі дыям. 6—8 см, жоўтыя, адзіночныя або ў шчыткападобных суквеццях. Цвітуць у маі—чэрвені. Плод — сямянка. Дэкар. і лек. расліны, выкарыстоўваюцца для групавых пасадак, у міксбордэрах, на газонах і камяністых горках. Размнажаюць дзяленнем карэнішчаў. *Г.У.Вынаеў.*

Да арт. **Дарожныя восы**. Пампіл дарожны.

ДАРО́НІНА Таццяна Васілеўна (н. 12.9.1933, С.-Пецярбург), руская актрыса, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1981). Скончыла Школу-студыю МХАТ (1956). З 1959 у Ленінградскім Вял. драм. т-ры, у 1972—83 у Маск. драм. т-ры імя У.Маякоўскага, у 1966—72 і з 1983 у МХАТ імя М.Горкага. З 1987 маст. кіраўнік сцэны на Цвярскім бульвары (з 1989 самаст. т-р, які захаваў назву МХАТ імя М.Горкага) — дырэктар, гал. рэжысёр, маст. кіраўнік. Актрыса моцнага, глыбокага тэмпераменту. Сярод роляў: Надзея («Мая старэйшая сястра» А.Валодзіна; і ў кіно), Настасся Піліпаўна («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Аркадзіна («Чайка» А.Чэхава), лэдзі Макбет («Макбет» У.Шэкспіра; і рэжысёр). З 1956 здымаецца ў кіно: «Тры таполі на Плюшчысе», «Яшчэ раз пра каханне», «Мачаха» і інш.

ДАРО́ХІН Уладзімір Васілевіч (н. 1.1.1948, г. Слонім Гродзенскай вобл.), бел. кампазітар, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1988). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1973). З 1978 адказны сакратар, з 1986 нам. старшыні праўлення Саюза кампазітараў Беларусі.

Даронікум аўстрыйскі.

Дарожныя машыны: 1 — аўтабетоназмяшальнік для прыгатавання і дастаўкі бетоннай сумесі; 2 — гусенічны прафілёўшчык для будаўніцтва дарог мясцовага значэння; 3 — гусенічны асфальтаўкладчык; 4 — гусенічная аўтаматызаваная грунтазмяшальная машына; 5 — машына для стварэння ўмацавальных палос; 6 — самаходны нарэзчык швоў; 7 — заліўшчык швоў пры будаўніцтве цэментабетонных пакрыццяў; 8 — маркіровачная машына для нанясення раздзяляльных ліній.

З 1986 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі (з 1991 дацэнт). Найб. значныя дасягненні Д. ў галіне сімф. музыкі. З пач. 1980-х г. творчасць набыла неарамант. кірунак. Сярод твораў: араторыя «Зямля Беларусі» на вершы П.Броўкі (1981), кантата «Арабскія прытчы» на вершы Абу Нуваса (1996); сімфоніі (1976, 1979; «Францыск Скарына: жыццё і бессмяротнасць», 1990), канцэрт для фп. з аркестрам (1983), сюіта «Мемарыял» для камернага арк. (1984), сімф. паэмы, у т.л. «Уяўленне і плач аб пакінутай вёсцы» (1992), «Пастараль» для габоя і камернага арк. (1988), «Музыка» для флейты і камернага ансамбля (1994); камерна-інстр. творы, вак. цыклы на вершы А.Блока і І.Буніна; музыка да драм. спектакляў. *Р.М.Аладава.*

ДАРО́ШКА Пятро Апуфрыевіч (24.12.1910, с. Тупічаў Чарнігаўскай вобл., Украіна), украінскі пісьменнік. Скончыў Харкаўскі ун-т (1933). Друкуецца з 1928. У зб-ках вершаў «Перад навальніцай» (1935), «Жывыя крыніцы» (1960), «След» (1971) і інш. арганічна спалучаны публіцыстычны пафас і мяккі лірызм, паэтызуюцца краса роднай зямлі і чысціня пачуццяў. У аповесці «Лясная Гута» (1964), рамане «Не паўтары маю долю» (1968) вострыя маральна-этычныя праблемы. Аўтар паэм прысвячэнняў М.Чарнышэўскаму «Вілюйскі вязень» (1955) і Т.Шаўчэнку «Спалох уначы» (1965), кніг твораў для дзяцей, зб. апавяданняў і ўспамінаў «Ад зары да зары» (1987). Пераклаў на ўкр. мову творы П.Броўкі, Я.Коласа, Я.Купалы, П.Панчанкі. На бел. мову яго творы пераклалі М.Аўрамчык, М.Гамолка, К.Кірэенка.

Тв.: Вибрані твори. Т. 1—2. Київ, 1980; Бел. пер. — у кн.: Украінская савецкая паэзія. Мн., 1975. Т. 1. *В.А.Чабаненка.*

ДАРСАНВАЛІЗА́ЦЫЯ, метад лек. выкарыстання пераменнага імпульснага току высокай частаты (110—140 кгц), напружання (дзесяткі тысяч вольт) і малой сілы (100—200 мА); адзін з метадаў *электралячэння*. Прапанаваны франц. вучоным Ж.А.Д'Арсанвалем у 1891.

Адрозніваюць Д. мясцовую і агульную. Пры мясц. Д. ўздзейнічаюць на асобныя ўчасткі цела хворага пры неўралгіі, галаўных болях, вагінізме, гемароі, варыкозным расшырэнні вен галёнкі, незагойванні ран і язваў, абмаражэнні, скурным свербе, пачатку абліТэруючых захворванняў сасудаў і ў касметычных мэтах. Агульная Д. — уздзеянне на ўвесь арганізм хворага пры гіпертанічнай хваробе, неўрастэніі, парушэннях сну, некат. хваробах абмену рэчываў. Д. мае заспакаяльнае дзеянне, стымулюе абмен рэчываў, паніжае высокі артэрыяльны крывяны ціск.

ДАРУЧЭ́ННЕ, цывільна-прававое пагадненне, паводле якога адзін бок (даверацы) абавязваецца здзейсніць ад імя і за кошт другога боку (даверыцель) пэўныя юрыд. дзеянні (набыццё або адчужэнне маёмасці, правядзенне плацяжоў і да т.п.). Даверацы абавязаны выканаць Д. асабіста. Ён можа перадаць выкананне Д. інш. асобе толькі ў тым выпадку, калі гэта абумоўлена пагадненнем або калі да гэтага вымушаюць абставіны абароны інтарэсаў даверніка. Давернік абавязаны аплаціць даверанаму ўзнагароджанне, калі гэта прадугледжана законам або дагаворам. Парадак выканання Д., правы і абавязкі яго ўдзельнікаў рэгламентуюцца цывільным заканадаўствам. *Э.І.Кузьмянкова.*

ДАРФУ́Р, плато ў зах. ч. Судана, водападзел паміж бас. воз. Чад і р. Белы Ніл. Пераважаюць цокальныя раўніны выш. 1000—1500 м, над якімі ўзвышаюцца астраўныя горы выш. да 3088 м (патухлы вулкан Мара). Клімат экватарыяльна-мусонны. Ландшафты тыповых і апустыненых саваннаў.

ДАРЫГА́НГА, вулканічная вобласць на У Манголіі. Патухлыя вулканы (выш. да 1778 м), палі базальтавых лаў, буйныя масівы пяскоў. Расліннасць паўпустынная і стэпавая.

ДАРЫЕ́НКА Дамнікія Цімафееўна (н. 15.1.1919, с. Далінскае Адэскай вобл., Украіна), малдаўская актрыса. Нар. арт. СССР (1974). Скончыла Адэскае тэатр. вучылішча (1937). Працавала ў Малд. т-ры ў Тыраспалі (цяпер Муз.-драм. т-р імя Пушкіна ў Кішынёве). Сярод лепшых роляў: Васілуца («Каса маре» І.Друцэ), Стэха («Назар Стадоля» Т.Шаўчэнкі), Хрысціна («Патомкі» Ю.Яноўскага), Маўра («Дзяўчына шчасце шукала» паводле В.Кабылянскай), Кручыніна («Без віны вінаватыя» А.Астроўскага), Таццяна («Ворагі» М.Горкага), Эльміра («Тарцюф» Мальера).

ДАРЫЕ́НКА Пётр Сцяпанавіч (16.4.1923, с. Далінскае Адэскай вобл., Украіна — 9.7.1976), малдаўскі паэт. У 1963—67 міністр культуры Малдавіі. У лірычных зб-ках «Светлыя дарогі» (1951), «Раскажы мне, Днестр!» (1955), «Сляды чалавека» (1964), «Лёс кахання» (1977), «Станцыя адпраўлення» (1977, на рус. мове) і інш. апаэтызаваў гераізм сав. людзей у Вял. Айч. вайну, іх працу ў гады мірнага буд-ва. Аўтар драм. твораў «Калі спее вінаград» (1961), «Перад адпачынкам» (1973), кніг нарысаў, эсэ «Новыя знаёмствы: Пуцявыя нататкі» (1973), «Людзі маёй біяграфіі» (1979) і інш.

ДА́РЫЙ, імя цароў дынастыі *Ахеменідаў* у стараж.-перс. *Ахеменідаў дзяржаве.*

Дарый I Вялікі (550—486 да н.э.), цар у 522—486 да н.э. Стаў правіць пасля забойства *Гаўматы*. У выніку ліквідацыі ў 522—521 паўстанняў у Вавілоніі, Персіі, Мідыі, Маргіяне, Эламе, Егіпце, Парфіі, Сатагідыі і скіфскіх плямён у Сярэдняй Азіі, заваявання персамі ў 519—512 Фракіі, Македоніі і паўн.-зах. ч. Індыі аднавіў магутнасць дзяржавы Ахеменідаў. Каб палепшыць кіраванне дзяржавай, каля 519 ініцыраваў правядзенне адм.-фін. і інш. рэформаў: падзел дзяржавы на 20 адм.-падатковых акруг (*сатрапій*) на чале з цывільнымі намеснікамі (*сатрапамі*), увядзенне агульнадзярж. манетнай адзінкі (гл. *Дарык*), рэарганізацыя кіравання арміяй (военачальнікі сталі незалежнымі ад сатрапаў і падпарадкоўваліся непасрэдна цару), наладжванне рэгулярнай паштовай службы і інш. У 513—512 здзейсніў няўдалы паход супраць скіфаў. Пры Д. I актывізаваліся знешнегандаль і буд-ва, пачаліся *грэка-персідскія войны*.

Дарый II Нот (?—404 да н.э.) цар у 424—404 да н.э. Сын *Артаксеркса* I. Правіў ва ўмовах аслаблення магутнасці дзяржавы Ахеменідаў (сепаратызм і міжусобіцы сатрапаў, антыперс паўстанні паміж 411—408 да н.э. ў Малой Азіі, Мідыі, Егіпце).

Дарый III Кадаман (каля 380 — ліп. 330 да н.э.), апошні ахеменідскі цар [336—330 да н.э.]. Да ўступлення на прастол быў сатрапам Арменіі. У канцы 335 заваяваў Егіпет. Пасля

Аўдыенцыя ў Дарыя I Вялікага. Рэльеф са скарбніцы у Персеналі. 6—5 ст. да н.э.

разгрому сваёй арміі войскамі Аляксандра Македонскага пры р. Гранік (334), Ісе (333) і Гаўгамелах (331) уцёк у Бактрыю, дзе забіты сатрапам Бесам.

ДАРЫ́ЙЦЫ, даране (Dōrieis), адно з асноўных стараж.-грэч. плямён паўн.-зах. дыялектнай групы. Першапачаткова жылі ў Паўн. і Сярэдняй Грэцыі. На працягу 12 ст. да н.э. разам з інш. паўн. плямёнамі перасяляліся ў паўд.-зах напрамку, што прывяло да выцяснення *ахейцаў* і знішчэння ахейскіх цэнтраў — *Мікенаў*, Тырынфа, *Піласа* і інш. Д. занялі вобласці Лаканіка, Месенія, Кінурыя, Аргаліда, Мегарыда (п-аў Пелапанес), Карынфія (Істмійскі перашыек), потым каланізавалі а-вы Родас, Крыт, Фера, Мелас, Кос, Калімнас, узбярэжжа М.Азіі (гарады Кнід, *Галікарнас* і інш.). У 8—6 ст. да н.э. афармліся іх раннерабаўладальніцкія дзярж. аб'яднанні (*Спарта, Аргас*, полісы Крыта) і ўзніклі іх калоніі па-за межамі Грэцыі (напр., *Сіракузы*). Ад імя Д. паходзіць назва арх. *дарычнага ордэра*.

ДА́РЫК, старажытнаперсідская залатая манета; першая залатая манета стара-

жытнасці. Стала выраблянца пры *Дарыі* I (каля 516 да н.э.; назва ад імя Дарыя). Маса — 8,4 г золата. Д. быў асновай манетнай сістэмы. Чаканіўся на царскім манетным двары ў *Персепалі* (да заваёвы Персіі *Аляксандрам Македонскім*).

ДАРЫ́О (Darío) Рубэн [сапр. Гарсія Сармьента (García Sarmiento) Фелікс; 16.11.1867, г. Сьюдат-Дарыо, Нікарагуа — 6.2.1916], нікарагуанскі паэт, журналіст, буйнейшы прадстаўнік т.зв.



Р.Дарыо.

лацінаамер. мадэрнізму. Быў консулам Нікарагуа ў Парыжы (1893—98), паслом у Іспаніі (1908—10), карэспандэнтам. Вядомасць прынеслі зб-кі «Рыфы» і «Рыфмы» (абодва 1887), «Блакіт» (1888), «Язычніцкія псалмы» (1896). Лірыка Д. вызначаецца пантэісцкім бачаннем свету, культам прыгажосці, музычнасцю і пластычнасцю: зб-кі «Песні жыцця і надзеі» (1905), «Паэма восені і іншыя вершы» (1910) і інш. Яго эсэістыка спрыяла засваенню лацінаамерыканскай еўрап. культуры і ўсведамленню нац. самабытнасці (зб-кі «Сучасная Іспанія», 1901, «Увесь палёт», 1912, і інш.). У вершах і публіцыстыцы адлюстраваліся рэзкае непрыманне каштоўнасцей бурж. грамадства, абарона права на паліт. незалежнасць. Аўтар мемуарнай прозы («Гісторыя маіх кніг», 1913, «Жыццё Рубэна Д., расказанае ім самім», 1915, і інш.).

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1981.

К.М.Міхееў.

ДАРЫ́ЧНЫ О́РДЭР, адзін з трох асноўных грэч. арх. *ордэраў*. Нясучыя часткі — ствол калоны (аздоблены *канелюрамі*) з *капітэллю*. У ніжняй частцы ($^1/_3$ вугальнай вышыні) ствол мае невял. выпукласць — *энтазіс*. Капітэль складаецца з шыйкі, што злучае капітэль са ствалом калоны, *эхіна* (паўвала) і верхняй квадратнай у плане пліты — *абака*. Над абакам — бэлька (*архітраў*), завершаная палічкай, над архітравам — *фрыз*, расчлянёны *трыгліфамі* на роўныя часткі (*метопы*), упрыгожаныя размалёўкай або скульптурай. Верхняя частка складалася з прамавугольных плит — *мутул* («сухарыкі», *дэнтыкулы*), высунутай пліты слязніцы і ўвянчальнай часткі — сімы.

Як мастацка выразная форма Д.о. склаўся ў Стараж. Грэцыі і дарыйскіх абласцях пры буд-ве храмаў і інш. грамадскіх збудаванняў з мармуру (600—590 да н.э.). Класічныя ўзоры Д.о. захаваліся ў *Парфеноне*, на Прапілеях, на Акропалі ў Афінах.

ДАРЭ́ (Doré) Густаў Вінсент Шарль (6.1.1832, г. Страсбур, Францыя — 23.1.1883), французскі графік. Самавучка. З 1848 публікаваў у гумарыстычных часопісах Парыжа вострахарактарныя літаграфіі пра парыжскіх абывацеляў (сюіты «Розная публіка Парыжа», «Парыжскі звярынец»). Вядомасць прынеслі жывапісна-дынамічныя, гратэскна-выразныя, поўныя фантазіі і гумару ілюстрацыі да «Гарганцюа і Пантагруэля» Ф.Рабле (1854), «Свавольных апавяданняў» А. Бальзака (1855—56), «Боскай камедыі» Дантэ (1861), «Дон Кіхота» М.Сервантэса (1862—63), Біблії (1864—66), «Страчанага раю» Дж.Мільтана (1865—66). Гэтыя малюнкі гравіраваліся майстрамі школы тарцовай ксілаграфіі, якая ўзнікла пад уплывам Д. Вядомы і як скульптар (помнік А.Дзюма-бацьку ў Парыжы, 1882).

Літ.: Дьякоў Л. Г.Доре. М., 1983.

Да арт. **Дарычны ордэр**. Храм Парфенон у Афінах. 447—438 да н.э.

ДА́РЭЛ (Durrell) Джэралд Малкам (7.11.1925, г. Джамшэдпур, Індыя — 30.1.1995), англійскі натураліст, пісьменнік. У 1928 сям'я пераехала ў Англію, у 1935 — на в-аў Корфу (Грэцыя), з 1939 зноў у Англіі. У 1947 арганізаваў і ўзначаліў сваю першую экспедыцыю па збіранні калекцыі рэдкіх жывёл у Афрыку, пазней — у Паўд. Амерыку, Паўд.-Усх. Азію, Аўстралію, Новую Зеландыю і інш. На в-ве Джэрсі (Англія) заснаваў і ўзначаліў заапарк (1958) і фонд па захаванні дзікіх жывёл (1964). Вядомасць прынесла першая кн. «Перапоўнены каўчэг» (1953). Аўтар больш як 20 кніг: «Мая сям'я і іншыя жывёлы» (1956), «Сустрэчы з жывёламі» (1959), «Заапарк у маім багажы» (1960), «Птушкі, жывёлы і родзічы» (1969), «Зялёны рай» (1978) і інш., якія вызначаюцца шчырай любоўю да прыроды, бездакорным стылем, тонкім гумарам і вобразнай мовай.

Н.М.Саркісава.

ДАРЭ́ННЕ, у цывільным праве пагадненне, паводле якога адзін бок перадае бязвыплатна другому боку маёмасць ва ўласнасць. Дагавор Д. лічыцца заключаным у момант перадачы маёмасці. Д. грамадзянамі маёмасці арганізацыям можа быць абумоўлена выкарыстаннем гэтай маёмасці для пэўнай грамадскай карыснай мэты. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь дагавор Д. на суму больш за 50 мінімальных зарплат і дагавор Д. валютных каштоўнасцей на суму больш за 10 мінімальных зарплат павінны быць натарыяльна засведчаны. Дагавор Д. грамадзянамі маёмасці арг-цыям заключаецца ў простай пісьмовай форме. Дагавор Д. жылога дома павінен быць натарыяльна засведчаны і зарэгістраваны ў выканаўчым к-це адпаведнага мясц. Савета дэпутатаў.

Э.І.Кузьмянкова.

ДАР-ЭС-САЛА́М (Dar es Salaam), горад у Танзаніі. Месцазнаходжанне ўрада. Адм. ц. Прыбярэжнай вобл. 1436 тыс. ж. (1990). Гал. марскі порт краіны, на беразе Індыйскага ак. (абслугоўвае часткова суседнія краіны). Чыг. станцыя, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Пачатковы пункт нафтаправода ў Замбію. Прам-сць: нафтаперапр., цэм., аўтазборачная, тэкст., эл.-тэхн., харчасмакавая

Г.Дарэ. Уезд Гарганцюа ў Парыж. Іл. да кнігі «Гарганцюа і Пантагруэль» Ф.Рабле.

(мясакансервавая, тытунёвая, мукамольная, піваварная), абутковая. Суднабудаванне (пераважна рыбацкіх суднаў). Вытв-сць лакаў, фарбаў, мыла, мэблі. Рыбалоўства. Ун-т. Бат. сад. Гісторыка-этнагр. музей.

Засн. ў 1862 султанам Занзібара на месцы рыбацкай в. Мзізіма. У 1887 захоплены герм. усх.-афр. кампаніяй. З 1891 адм. ц. Герм. Усх. Афрыкі. У 1916 акупіраваны англ. войскамі. У 1919—61 цэнтр англ. каланіяльнай адміністрацыі Танганьікі. У 1861—64 сталіца незалежнай дзяржавы Танганьіка, у 1964—73 — Танзаніі.

ДАРЭ́ЎСКАЯ Апалонія (вядома і як Дарота; 1767 ?—?), танцоўшчыца. Прыгонная падскарбія надворнага літ. А.Тызенгаўза, выхаванка яго балетных школ у Гродне і Паставах. У 1778 выступіла як фігурантка ў школьным паказе «Сялянскага балета» Г.*Петынеці* ў Гродзенскім т-ры Тызенгаўза. Паводле завяшчання магната перайшла ва ўласнасць Станіслава Аўгуста Панятоўскага і з 1785 першая салістка трупы «Т-ва танцоўшчыкаў яго каралеўскай вялікасці» ў Варшаве; гратэскавая танцоўшчыца на прыдворнай сцэне і ў Нац. т-ры. Партыі: у балетах «Мірза і Ліндор», «Рыбакі», «Лукас і Калінета», «Па-дэ-дэ» Ф.Шлянцоўскага (у дуэце з аўтарам, 1788). У 1794—97 у прыватных антрэпрызах Варшавы і Гданьска (Польшча). У 1797 па ініцыятыве і за кошт Станіслава Аўгуста выехала ў Пецярбург.

Г.І.Барышаў.

ДАР'Я́ (цюрк.-перс.), рака. У мовах народаў Сярэдняй Азіі тэрмін выкарыстоўваецца для абазначэння вял. рэк (Амудар'я, Сырдар'я).

ДАР'Я́ЛЬСКАЯ ЦЯСНІ́НА, у даліне р. Церак, у месцы перасячэння ёю Бакавога хр. Вял. Каўказа, у Грузіі і Паўн. Асеціі. На працягу 3 км глыб. да 1000 м. Па Д.ц. праходзіць *Ваенна-Грузінская дарога*. Д.ц. была вядома стараж. географам як «Вароты Каўказа» (Аланскія вароты).

ДАСА́ЕВА Таццяна Мікалаеўна (н. 27.7.1951, в. Знамя Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. літ.-знавец і крытык. Канд. філал. н. (1989). Скончыла БДУ (1973). Настаўнічала. З 1977 у Ін-це л-ры Нац. АН Беларусі. Друкуецца з 1978. Даследуе бел. прозу 1920—30-х г. (П.Галавач, Ц.Гартны, М.Гарэцкі, М.Зарэцкі, Л.Калюга, Б.Мікуліч, К.Чорны і інш.), сучасны літ. працэс. Укладальнік і аўтар каментарыя да 2-га і 7-га т. Збору твораў І.Мележа ў 10 т. (1979—85), «Летапісу жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага» ў 4-м т. Збору твораў Гарэцкага ў 4 т. (1984—86).

Тв.: Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага. Мн., 1993; Пошукі героя: З вопыту бел. прозы 20-х гг. Мн., 1993.

ДАСКАЛО́Ў Стаян Цэкаў (22.8.1909, в. Ліляча Врачанскай акр., Балгарыя — 1985), балгарскі пісьменнік. Скончыў Сафійскі ун-т (1942). Нар. дзеяч культуры Балгарыі (1967). Аўтар рамана-эпапеі «Шлях» (кн. 1—3, 1945—54), раманаў «Свая зямля» (1952, бел. пер. 1961 Н.Гілевіча), «Стубленскія ліпы» (1960), «Вёска ўскрай завода» (1963), «Рэспубліка дажджоў» (1968), «Наследніца» (кн. 1—2, 1975), зб. апавяданняў «Пакута» (1935), «Магдзін узгорак» (1940), «Двор» (1943), «Вясковыя душы» (1958), у якіх паказаны вясковае жыццё даваен. і пасляваен. Балгарыі, падзеі 2-й сусв. вайны, складаныя працэсы кааперацыі. Дзімітроўская прэмія 1950, 1969. У пер. на бел. мову выйшаў зб. «Любча-безбілетнік» (1959) і вершы ў зб. «Скарб» (1967).

Тв.: Рус. пер. — Огненные зори: Рассказы и повести. М., 1973. *Г.Я.Адамовіч.*

ДАСКАНА́ЛЫ ЛІК, цэлы дадатны лік, роўны суме сваіх правільных (меншых за гэты лік) дзельнікаў. Напр., 6 = 1+2+3; 28 = 1+2+4+7+14. Цотныя Д.л. вылічваюцца па формуле $2^{p-1}\cdot(2^p-1)$ (*Эўклід*; 3 ст. да н.э.) пры ўмове, што лікі p і (2^p-1) простыя; ніводнага няцотнага Д.л. не знойдзена.

ДАСЛЕ́ДАВАННЕ АПЕРА́ЦЫЙ, навуковы метад выпрацоўкі колькасна абгрунтаваных рэкамендацый для прыняцця рашэнняў у арганізац. кіраванні. Тэрмін узнік у ЗША у гады 2-й сусв. вайны (1939—45), калі пры ваен. штабах ствараліся групы, якія аналізавалі эфектыўнасць розных відаў зброі і ваенна-тактычных рашэнняў. З дапамогай матэм. аналізу і простых правіл вырашаюцца складаныя матэм. задачы. Д.а. мае значэнне ў механіцы, аўтаматыцы, электратэхніцы. Найб. ўплыў на развіццё гэтага метаду зрабілі А.Эрланг, Дж. фон Нейман, Л.В.Кантаровіч, Дж.Б.Данцыг, Р.Белман. Метады Д.а. маюць шырокае кола задач арганізац. кіравання, якія ўзнікаюць у прам-сці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы, іх выкарыстоўваюць страхавыя і рэкламныя кампаніі, агенцтвы па турызме, прадпрыемствы камунальнага абслугоўвання і інш. У даследаванні кожнай аперацыйнай задачы павінна быць 6 этапаў: пастаноўка задачы; пабудова матэм. мадэлі з'явы або аперацыі; аналіз мадэлі і атрыманне рашэння; праверка адэкватнасці мадэлі з'яве і аналіз якасці рашэння; карэкціроўка мадэлі і рашэння; рэалізацыя вынікаў рашэння. Работы на ўсіх пералічаных этапах маюць сэнс, калі яны завяршаюцца ўкараненнем вынікаў даследаванняў у практыку кіравання.

ДАСПЕ́ЎСКІ Станіслаў, гл. *Зограф* Захарый.

ДАСПЕ́ХІ, гл. ў арт. *Засцерагальнае ўзбраенне*.

ДАСТАЕ́ЎСКІ Фёдар Міхайлавіч (11.11.1821, Масква — 9.2.1881), рус. пісьменнік. Род Д. бел. паходжання; у 1506 яго продкі атрымалі грамату на в. Дастоева (Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл.). Скончыў Пецярбургскае ваенна-інж. вучылішча (1843). Дэбютаваў перакладам рамана А.Бальзака «Яўгенія Грандэ» (1844). Першы раман «Бедныя людзі» (1846) паставіў Д. ў шэраг вядомых прадстаўнікоў *натуральнай школы*. У 2-й пал. 1840-х г. захапляўся ідэямі сацыялістаў-утапістаў. За ўдзел у гуртку М.*Петрашэўскага* прыгавораны (1849) да пакарання смерцю, заменена катаргай (адбываў у Омску, 1850—54), потым праходзіў салдатчыну. На катарзе перажыў духоўны крызіс: страціў веру ў мажлівасць перабудовы грамадства рэв. шляхам. У той жа час абвастрыліся яго ўспрыманне чалавечых пакут і трывога за лёс чалавецтва. З 1859 жыў у Пецярбургу. Напісаў і выдаў творы «Дзядзечкаў сон», «Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары» (абодва 1859), «Прыніжаныя і зняважаныя» (1861). У «Запісках з Мёртвага дома» (1861—62) паказаў жахі катаргі. З братам Міхаілам выдаў часопісы «Время» (1861—63) і «Эпоха» (1864—65), у якіх прапагандаваў ідэі т.зв. поч-

Ф.М.**Дастаеўскі**. Партрэт мастака В.Пярова. 1872.

веніцтва. У 1863 напісаў аповесць «Запіскі з падполля», якія сталі вяхой на шляху распрацоўкі ім філас. рамана. Раманы «Злачынства і кара», «Гулец» (абодва 1866), «Ідыёт» (1868), «Падлетак» (1875), «Браты Карамазавы» (1879—80) адлюстравалі глыбокія супярэчнасці рас. рэчаіснасці і грамадскай думкі ў эпоху вял. сац. зрухаў у Расіі і Зах. Еўропе. У іх Д. выказаў бязмернасць пакут абяздоленага чалавека. Свет чалавечых пакут — аснова ўсёй рэаліст. творчасці пісьменніка. Пафас яго твораў — барацьба супраць арэчаўлення чалавека, нівеліроўкі і абясцэньвання асобы ва ўмовах капіталізму. Самыя вострыя праблемы часу Д. пераносіў у раманы, як у «лабараторныя» ўмовы, каб паказаць іх магчымы кірунак і вынік у маштабах усяго чалавецтва. Герой Д. — чалавек ідэі, непаўторнага светаўспрымання. Свядомасць гал. герояў Д. — арэна барацьбы пунктаў па-

гляду. Звычайна героі яго твораў паказваюцца ў моманты крызісу, пералому, калі ідэя авалодвае глыбінямі іх натуры, пераходзіць у моцнае пачуццё. У паказе здзеку з чалавечай годнасці, у перадачы самых тонкіх перажыванняў Д. дасягае незвычайных маст. вышынь. У рамане «Злачынства і кара» ён выкрыў бурж. індывідуалізм, паказаў заганнасць, антычалавечнасць тэорыі «права моцнага», «права на праліццё крыві». У ім гранічная напружанасць думкі і філас.-псіхал. дыялога. Дыялог у творах Д. разгортваецца як споведзь герояў. У рамане «Ідыёт» высакародны чалавек сутыкаецца з бесчалавечным грамадствам, раскрываецца яго трагічнае бяссілле перад амаралізмам і прагаю грошай. Вельмі моцна гучыць заўсёднае імкненне пісьменніка зберагчы веру ў чалавека, знайсці і ўвасобіць свой ідэал. Адначасова пісьменнік ідэалізаваў пакорлівасць і ўзвышаныя пакуты чалавека, праводзіў ідэю маральнага самаўдасканалення на рэліг. аснове. Самы супярэчлівы твор Д. раман «Д'яблы» (1871—72). Гэта ў нейкай ступені памфлет на рус. рэв. дэмакратыю, якую ён беспадстаўна атаясамліваў з бурж. індывідуалізмам. Разам з тым у творы ёсць і больш значны, глыбокі ідэйна-маст. змест, які робіць яго сугучным нашым сённяшнім адносінам да разбуральнага, цалкам амаральнага экстрэмізму. Раман «Падлетак» — пра драпежніцтва і маральны распад буржуазіі. Вяршыняй філас., сац. і псіхал. пошукаў пісьменніка з'яўляецца яго апошні раман «Браты Карамазавы». У ім адбіўся жах аўтара перад звярыным у чалавеку, перад яго разбэшчанасцю і эгаізмам, абвастрылася пакутлівае хістанне пісьменніка паміж ідэалізацыяй пакорлівасці і бунтам супраць яе. Д. стварыў новы тып рамана, блізкага да трагічнага тэатра. Ён выявіў важныя тэндэнцыі грамадскага развіцця, паставіў праблемы сусв. значнасці. Многія яго творы экранізуюцца і інсцэніруюцца.

Творы Д. зрабілі велізарны ўплыў на рус., бел. і сусв. л-ру. М.Гарэцкі (драма «Антон» і інш.), шукаючы адказы на шмат якія праблемы нац. характару, апіраўся і на маст.-псіхал. адкрыцці аўтара «Братоў Карамазавых». Бел. раман, які рабіўся ўсё больш псіхалагічным і аналітычным (творчасць К.Чорнага), вельмі плённа выкарыстоўваў вопыт Д. Прыкметныя сляды вучобы ў Д. ў творах М.Зарэцкага («Сцежкі-дарожкі» і інш.). У бел. перакладзе выйшлі раман Д. «Бедныя людзі» (1930, пер. Я.Плашчынскі), аповесці «Белыя ночы» і апавяданне «Пазункоў» (1971, пер. Л.Салавей). Першыя пастаноўкі твораў Д. на Беларусі адбыліся ў пач. 20 ст. Аматарскімі і прафес. калектывамі ставіліся спектаклі паводле раманаў Д. «Ідыёт» (Мінскае т-ва аматараў прыгожых мастацтваў, 1903; Т-ва рус. драмы, 1921; Бел. тэатр.-маст. ін-т, 1970), «Прыніжаныя і зняважаныя» (тэатр імя Я.Коласа, 1957, 1973), «Злачынства і кара» (Мінскае т-ва аматараў прыгожых мастацтваў, 1903; тэатр імя Я.Коласа, 1962), «Дзядзечкаў сон» (тэатр імя Я.Купалы, 1978). У в. Дастоева працуе літ.-краязнаўчы музей Д.

Тв.: Полн. собр. соч. Т. 1—30. Л., 1972—90.

Літ.: Бахтин М.М. Проблемы поэтики Достоевского. 4 изд. М., 1979; Фридлендер Г.М. Реализм Достоевского. М.; Л., 1964; Карякин Ю.Ф. Самообман Раскольникова. М., 1976; Достоевский в зарубежных литературах. Л., 1978; Селезнев Ю.И. Достоевский. 3 изд. М., 1990; Адамович А.М. Достоевский после Достоевского // Новый мир. 1981. № 10; Твардовская В.А. Достоевский в общественной жизни России (1861—1881). М., 1990; Ф.Достоевский: Библиогр. произв. Достоевского и лит. о нем, 1917—1965. М., 1968.

А.М.Адамовіч, Р.І.Баравік (тэатр).

ДАСТАЕ́ЎСКІЯ, шляхецкі род уласнага герба («Радван» зменены) у ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Вядомы з канца 15 ст., жылі на Піншчыне, у 17 ст. перасяліліся на Валынь і ў Навагрудскае ваяв. Родапачынальнік — Даніла Іванавіч Ірцішчавіч, які ў 1506 атрымаў ад пінскага кн. Ф.І.Ярославіча некалькі двароў, у т.л. Дастоева (адсюль прозвішча роду). Найб. вядомыя: Пётр, маршалак пінскі (1598—99); Яраш, падстараста оўруцкі (1604); Пётр, суддзя гродскі пінскі (1627—32); Бенядзікт, падчашы пінскі (1635); Андрэй, харужы валынскі (1649). Верагодна, з гэтага роду паходзіць рус. пісьменнік Ф.М.*Дастаеўскі*.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

ДАСТА́Н, эпічны жанр у літаратурах і фальклоры народаў Б. і Сярэдняга Усходу, Сярэдняй і Паўд.-Усх. Азіі — пераважна апрацоўка казачных сюжэтаў, легендаў і паданняў. Бываюць паэт. і празаічныя, часцей — гэта проза з вершаванымі ўстаўкамі. Д. ўласцівы гіпербалізацыя, ідэалізацыя героя, фантаст. і прыгодніцкія сітуацыі, любоўна-рамант. сюжэтныя лініі, славесныя і сюжэтныя клішэ. У класічных перс., тадж. і цюркамоўных л-рах Д. наз. асобныя раманічныя паэмы («Хасроў і Шырын», «Лейлі і Меджнун» Нізамі), раздзелы з вял. эпічных твораў (напр., з «Шахнамэ» Фірдаўсі). Цыклы фальклорныя Д. (напр., пашыраныя ў многіх народаў «Кораглу», «Алпамыш» і інш.) паўплывалі на развіццё нар. творчасці і пісьмовых л-р.

ДАСТА́НКА Анатоль Паўлавіч (н. 2.7.1937, в. Обчын Любанскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне мікраэлектронікі. Акад. Нац. АН Беларусі (1991; чл.-кар. 1986), д-р тэхн. н. (1979), праф. (1979). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1982), засл. вынаходнік СССР (1987). Скончыў Таганрогскі радыётэхн. ін-т (1962). З 1970 у Бел. дзярж. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (у 1985—93 прарэктар). З 1993 старшыня Вышэйшага атэстацыйнага к-та Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па фундаментальных праблемах матэрыялазнаўства, цвердацелай мікраэлектроніцы, тэхналогіі радыёэлектронных сістэм, тэхн. дыягностыцы. Распрацаваў комплекс тэхнал. працэсаў і абсталявання для вытв-сці вырабаў мікраэлектронікі. Дзярж. прэміі Беларусі 1982, 1996.

Тв.: Технология и автоматизация производства радиоэлектронной аппаратуры. М., 1989 (у саўт.); Пленочные токопроводящие системы СБИС. Мн., 1989 (разам з В.У.Баранавым, В.В.Шаталавым); Технология производства ЭВМ. Мн., 1994 (разам з М.І.Пікулем, А.А.Хмылем).

Р.М.Шахлевіч.



А.П.Дастанка.

ДАСТАТКО́ВАЙ ПАДСТА́ВЫ ПРЫ́НЦЫП, дастатковай падставы закон, прынцып логікі, паводле якога палажэнне лічыцца сапраўдным, калі яно грунтуецца на пераканаўчых падставах. Фактычна з'яўляецца асновай усіх лагічных тэорый старажытнасці, сярэднявечча і новага часу; як асобны прынцып сфармуляваны Г.*Лейбніцам*. Мае аналогію з прычыннай залежнасцю аб'ектыўных з'яў. Калі ў аб'ектыўным свеце ўсякая з'ява, дзеянне і інш. мае прычыну, то ў пазнанні сапраўднасць усякай думкі павінна быць абгрунтавана. У дэдукцыйных разважаннях і тэорыях за дастатковую падставу прымаецца даказанае выказванне або сукупнасць такіх, з якіх лагічна вынікае выказванне, якое абгрунтоўваецца. Закон выражае ўласцівасць доказнасці лагічна правільнага мыслення. У аксіяматычных сістэмах і падобных да іх строгіх лагічных пабудовах Д.п.п. патрабуе забеспячэння пераканальнасці выказванняў тэорыі, што разглядаюцца ў якасці яе тэарэм.

ДАСТАТКО́ВЫЯ ЎМО́ВЫ ў матэматыцы і логіцы, гл. ў арт. *Неабходныя і дастатковыя ўмовы*.

ДАСТО́ЕВА, вёска ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 16 км на ПнУ ад Іванава, 156 км ад Брэста, 19 км ад чыг. ст. Янаў-Палескі. 748 ж., 295 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аптэка, аддз. сувязі. Царква. Літ.-краязнаўчы музей Ф.М.*Дастаеўскага*.

ДАСУ́ЖАЎ Аляксандр Ігаравіч (н. 31.10.1945, г. Пухавічы Мінскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1970). Працуе пераважна ў жанры пейзажа. Для яго твораў характэрна імкненне да стварэння канцэптуальнага кірунку ў пейзажным жывапісе, дзе гал. выяўл. сродкі — паверхня, лінія, пляма: «Лету

адыходзячаму» (1984), «Па дарозе да зімы» (1985), «Праз чырвонае «Пераход», «Праз блакітнае «Да ракі на назве...», «Праз чорнае «Азбука хлусні» (1988), серыя «Канцэптуальны пейзаж» (1993—94) і інш. Творчасць вылучаецца выразнасцю, мэтанакіраванай абмежаванасцю маст. сродкаў, радыкальным адыходам ад прыродных формаў. *Ч.Ч.Шамшур.*

ДАСЬЕ́ (ад франц. dossier справа), збор дакументаў па якім-н. пытанні, справе, асобе, а таксама папка з такімі дакументамі.

ДАСЭ́ (Dausset) Жан Батыст Габрыэль (н. 19.10.1916, г. Тулуза, Францыя), французскі імунолаг. Чл. Франц. акадэміі навук і медыцыны, Бельг. каралеўскай акадэміі медыцыны, ганаровы чл. Амер. акадэміі навук і мастацтваў. Праф. эксперым. медыцыны (1978). Скончыў Парыжскі ун-т (1945). З 1946 дырэктар лабараторыі Франц. нац. цэнтра пералівання крыві, з 1948 у Гарвардскім, з 1958 у Парыжскім ун-тах, з 1968 дырэктар Франц. нац. ін-та навук. даследаванняў. Навук. працы па імунагематалогіі, выявіў новую сістэму лейкацытарных антыгенаў, даследаваў іх ролю ў транспланталогіі. Першыя работы ў Францыі па трансплантацыі. Нобелеўская прэмія (1980; разам з Б.*Бенасерафам* і Дж.Д.*Снелам*).

ДАСЭ́Н (Dassin) Джо (5.11.1938, Нью-Йорк — 21.8.1980), французскі шансанье, кампазітар. Сын франц. кінарэжысёра Жуля Д. і скрыпачкі Б.Лонер. Дзед Д. — выхадзец з Расіі (эмігрыраваў у ЗША у пач. 20 ст.). Скончыў Мічыганскі ун-т як этнолаг. Вывучаў амер. і індзейскі фальклор, інтанацыі якога пазней ляглі ў аснову многіх яго песень. У 1950-я г. пакінуў ЗША, жыў у іншых краінах, застаўся ў Францыі. У пач. творчасці зазнаў уплыў франц. кампазітара і шансанье Ж.Брасенса. З 1967 выступаў на эстрадзе (з 1969 у т-ры «Алімпія»). Сярод яго песень найб. папулярныя «Бабіна лета», «Елісейскія палі».

ДАТАЛІ́Т (ад грэч. dateomai дзялю, падзяляю + ...*літ*), мінерал падкласа борасілікатаў, гідраксілборасілікат кальцыю, CaB[SiO$_4$]OH. Крышталізуецца ў манаклінай сінганіі. Крышталі, зярністыя і шчыльныя агрэгаты, нацёчныя і радыяльна-прамянёвыя выдзяленні. Колер белы да бясколернага, часта з зеленаватым адценнем. Бляск шкляны. Паўпразрысты да празрыстага. Цв. 5—5,6. Шчыльн. 2,8—3 г/см^3. Гідратэрмальнага паходжання. Выкарыстоўваецца як другарадны вырабны матэрыял і борная руда. *У.Я.Бардон.*

ДАТА́ЦЫЯ (ад лац. dotatio падарунак, ахвяраванне), дзяржаўная дапамога арг-цыям і прадпрыемствам, а таксама грамадзянам для пакрыцця расходаў або на інш. мэты; сродкі, якія выдаюцца ніжэйстаячаму бюджэту са сродкаў вышэйстаячага. Адрозніваюць Д. прадпрыемствам, сабекошт прадукцыі якіх перавышае выручку ад яе рэалізацыі, грамадзянам, жыццёвы ўзровень якіх не адпавядае элементарным патрэбам, і бюджэтную. Ва ўмовах Беларусі Д. прадпрыемствам шырока выкарыстоўвалася ў аднаўленчы перыяд, у гады індустрыялізацыі, пасля Вял. Айч. вайны для развіцця нар. гаспадаркі. У сучасны перыяд развіццё гасп.-разліковых адносін дало магчымасць адмовіцца ад сістэмы Д. у большасці галін нар. гаспадаркі. Яна захавалася толькі ў сельскай гаспадарцы, некаторых галінах перапрацоўчай і здабыўной прам-сці, на планава-стратных прадпрыемствах, у асобных арг-цыях невытворчай сферы.

ДА́ТАЧНЫЯ ЛЮ́ДЗІ, асобы, якія пажыццёва выконвалі ваенную дзярж. павіннасць на Русі ў канцы 15—17 ст. Выстаўляліся ад гар. і сельскага цяглага насельніцтва. Колькасць Д.л. у арміі



Датычная плоскасць.



Да арт. **Датычная прамая**: 1 — M_0T — датычная прамая да крывой L_1 у пункце M_0; 2 — крывая L_2 не мае датычнай прамой у пункце M_0.

была значная (у час паходу на Полацк 1563 іх было 80 тыс.). У сярэдзіне 17 ст. Д.л. ў складзе палкоў новага строю. З 1705 заменены рэкрутамі.

ДАТУ́Н, горад на Пн Кітая, у паўн. ч. прав. Шаньсі. Каля 1 млн. ж. (1994). Вузел чыгунак. Адзін з гал. цэнтраў здабычы каменнага вугалю ў краіне. Буйныя маш.-буд. і цэм. з-ды.

ДАТЧА́НЕ, нацыя, асн. насельніцтва *Даніі* (5 млн. чал.). Жывуць таксама ў ЗША, Германіі, Канадзе, Швецыі, Нарвегіі і інш. Агульная колькасць 5,6 млн. чал. (1992). Гавораць на *дацкай мове*. Вернікі пераважна лютэране, частка — католікі.

ДА́ТЧЫК, элемент вымяральнага, сігнальнага, рэгулявальнага або кіравальнага прыстасавання, які пераўтварае велічыню, што кантралюецца (ціск, т-ру, частату, эл. напружанне і інш.), у сігнал, зручны для вымярэння, перадачы, захоўвання, апрацоўкі, рэгістрацыі, а таксама для ўздзеяння ім на кіроўныя працэсы. Звычайна мае ўспрымальны (адчувальны) орган і адзін або некалькі прамежкавых пераўтваральнікаў. Тэрмін «Д.», які ўжываецца ў шырокім сэнсе, стандартам заменены на тэрмін *вымяральны пераўтваральнік*.

ДАТЫДЭЯ́ЛЬНЫЯ (Dothideales), парадак сумчатых грыбоў падкл. *аскалакулярных*. Каля 3 тыс. відаў. Пашыраны па ўсім зямным шары, пераважна ва ўмераных зонах Еўразіі, у Паўд. Амерыцы. На Беларусі каля 40 відаў, 10 родаў, найб. вядомыя афіябол, бікасферэла, вентурыя і інш. Сапратрофы, развіваюцца на адмерлых ч. раслін. Многія паразіты (канідыяльная стадыя) культ. раслін, выклікаюць паршу яблыні і грушы, цэркаспарозы і інш. хваробы.

Пладовыя целы (псеўдатэцыі) паглыблены ў субстрат, шара- або грушападобныя, чорныя, уключаюць адну ці некалькі локул. Сумкі 8-споравыя, цыліндрычныя, амаль яйца- або грушападобныя, сядзячыя ці на кароткай ножцы, размешчаны ў локулах.

ДАТЫ́ЧНАЯ ПЛО́СКАСЦЬ да паверхні ў пункце, плоскасць, у якой ляжыць датычная прамая да кожнай лініі на паверхні, праведзенай праз гэты пункт.

Калі паверхня вызначана ўраўненнем $F(x, y, z) = 0$, дзе $F(x, y, z)$ — дыферэнцавальная функцыя, ураўненне Д. п. да гэтай паверхні ў яе пункце $M_0(x_0, y_0, z_0)$ мае выгляд $(F'_x)_0 (x-x_0) + (F'_y)_0(y-y_0) + (F'_z)_0(z-z_0) = 0$, дзе $(F'_x)_0$, $(F'_y)_0$, $(F'_z)_0$ — частковыя вытворныя функцыі $F(x, y, z)$ у пункце M_0. Д.п. да паверхні σ у пункце M_0 характарызуецца тым, што адлегласць h ад гэтай плоскасці да зменнага пункта M паверхні σ пры імкненні M да M_0 з'яўляецца бясконца малой у параўнанні з адлегласцю MM_0.

ДАТЫ́ЧНАЯ ПРАМА́Я да крывой лініі, лімітнае становішча адпаведнай сякучай.

Няхай M_0 — зафіксаваны пункт крывой l, M — іншы яе пункт. M_0M — сякучая (прамая, праведзеная праз гэтыя пункты). Калі пры неабмежаваным набліжэнні M да M_0 сякучая M_0M імкнецца да пэўнай прамой M_0T, то прамая M_0T наз. Д.п. да крывой l у пункце M_0. У выпадку плоскай крывой, вызначанай у дэкартавых каардынатах ураўненнем $y=f(x)$, дзе $f(x)$ — дыферэнцавальная функцыя, ураўненне Д.п. да яе ў пункце $M_0(x_0, y_0)$ мае выгляд $y-y_0=f'(x_0)(x-x_0)$, дзе $f'(x)$ — вытворная функцыя $f'(x)$ у пункце x_0. Д.п. ўтварае з дадатным напрамкам восі OX вугал, тангенс якога роўны $f'(x)$. Д.п. мае не кожная неперарыўная крывая, паколькі прамая M_0M можа і не імкнуцца да лімітнага становішча або можа імкнуцца да двух розных лімітных становішчаў, калі M імкнецца да M_0 з розных бакоў ад M_0. *А.А.Гусак.*

ДАТЫЯРА́ЛЬНЫЯ (Dothiorales), парадак сумчатых грыбоў падкл. *аскалакулярных*. Пашыраны ў субтрапічных і трапічных раёнах, многія — ва ўмеранай зоне. На Беларусі трапляюцца віды з родаў батрыясферыя, датыёра, гіньярдыя. Сапратрофы на розных раслінных

рэштках, паразіты на лісці, сцяблах, пладах розных раслін.

Пладовыя целы (псеўдатэцыі) падушкаабо коркападобныя, чорныя, з адной ці некалькімі локуламі, часам зрастаюцца. Сумкі 2—16-споравыя, булавападобныя, на кароткай ножцы. Споры адна- ці шматклетачныя. У цыкле развіцця адзначаны канідыяльныя стадыі.

ДА́У, Доу (Dou) Герард (7.4.1613, г. Лейдэн, Нідэрланды — 9.2.1675), галандскі жывапісец. Вучыўся ў свайго бацькі Я.Дау і ў *Рэмбранта* (1628—31), якому наследаваў у ранні перыяд творчасці. Пісаў пераважна невял. жанравыя карціны, у якіх ствараў вобразы вучоных, музыкантаў, гандлярак і інш.: «Астраном», «Зубны ўрач», «Скрыпач», «Гандлярка селядцамі» і інш. Натуралістычна-дакладнае адлюстраванне прадметаў, цікавыя сюжэты, спалучаныя з вонкавай прыгажосцю, дэкар. і светлавымі эфектамі, прынеслі яму славу моднага партрэтыста і майстра мініяцюрнага нацыянальнага жывапісу — своеасаблівага «галандскага ракако».

Г.Дау. Служанка ў акне. 1640.

ДА́УД Мухамед (18.7.1908, Кабул — 28.4.1978), дзяржаўны дзеяч Афганістана. Адукацыю атрымаў у Афганістане і Францыі. У 1946—48, 1949—52 міністр нац. абароны. У 1953—63 прэм'ер-міністр Афганістана. Урад Д. рэфармаваў сістэму школьнай адукацыі, садзейнічаў развіццю афг. прам-сці, умацаванню крэдытна-фін. сістэмы і інш. У ліп. 1973 на чале групы афіцэраў скінуў караля і абвясціў краіну рэспублікай. У 1973—78 прэзідэнт і прэм'ер-міністр Афганістана, адначасова міністр замежных спраў і абароны; намагаўся ліквідаваць перажыткі феадалізму ў афг. грамадстве, наладзіў адносіны з СССР. Забіты ў час Красавіцкай рэвалюцыі 1978.

ДА́УРСКІ ХРЫБЕ́Т. У цэнтральнай ч. Забайкалля, у межах *Даурыі*, у Чыцінскай вобл. Расіі. Сістэма выцягнутых у паўн.-ўсх. напрамку горных масіваў даўж. каля 300 км ад вярхоўяў р. Джыла да вытокаў р. Ульдурга. Выш. да 1526 м. Складзены з граніта і крышт. сланца. Пераважае сярэднягорны рэльеф. На схілах хваёвыя і лістоўнічныя лясы. Перасякаецца далінай р. Інгада, дзе праходзяць чыгунка і аўтадарога.

ДАЎРЫЯ, Даурская зямля, руская назва ч. тэр. Забайкалля і (да 17 ст.) зах. Прыамур'я. Да сярэдзіны 17 ст. была населена даурамі (дахурамі). Тэр. паўд. Забайкалля ад воз. Байкал да Яблanавага хр. называюць Байкальскай Д., яе ч. на У ад Яблanавага хр. — Нерчынскай Д., самую паўд. ч. на У ад ракі Селенга — Селенгінскай Д.



Ж.Дасэ.

М.Дауд.

П.Л.Даўбешкін.

ДАЎБЕ́ШКІН Пётр Лукіч (8.10.1912, в. Паўлавічы Віцебскага р-на — 3.10.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Віцебскі фін.-эканам. тэхнікум (1934), Сумскае артыл. ваен. вучылішча (1937). У Чырв. Арміі з 1934. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Калінінскім, Бранскім, Цэнтр., 1-м Укр. франтах. Капітан Д. вызначыўся 22.9.1943 у баях каля г. Пераяслаў-Хмяльніцкі (Украіна): мінамётны дывізіён на чале з Д. фарсіраваў Дняпро, на захопленым плацдарме адбіў 8 контратак праціўніка. Загінуў у баі.

ДАЎБЁЖНАЕ РАМЯСТВО́, вытворчасць посуду і інш. вырабаў з дрэва спосабам даўбення ці апрацоўкі яго натуральных (дуплістых) формаў; адно з найб. стараж. рамёстваў. На Беларусі Д.р. практычна не вылучалася ў спецыялізаваны саматужны занятак і мела характар хатняй вытв-сці; карыты, кадаўбы, жлукты выраблялі ў вял. колькасці сяляне, якія не валодалі спец. навыкамі дрэваапрацоўкі. Выдзеўбаны посуд звычайна рабілі з мяккаслаёвых і падатлівых парод драўніны (ліпы, вольхі, асіны), чаўны і ступы — з дубу, хвоі. Карысталіся долатам, пешняй, разцом, скоблямі, сякерай, цыркулем, цяслой, чакухай (кожны інструмент выкарыстоўваўся на пэўнай тэхнал. стадыі і меў варыяцыйныя асаблівасці). Функцыянальнае прызначэнне розных відаў выдзеўбаных вырабаў накладвала адбітак на вонкавы выгляд, эстэтыку, якасць іх апрацоўкі. Асабліва старанна, па-мастацку выраблялі карцы, фаскі, кублы, апалушкі, сальніцы, бойкі. Тым жа спосабам рабілі некат. віды старасвецкай мэблі, шафы для адзення, драўляныя трубы для дымаходаў у сялянскім жыллі, водаадводаў і інш., калодных вулляў і інш. Выраб чаўноў нярэдка вылучаўся ў асобны промысел. У наш час выраб даўбёжнага посуду эпізадычна трапляецца ў прыватных гаспадарках.

В.С.Цітоў.



ДАЎБЁЖНЫ СТАНО́К, 1) металарэзны станок стругальнага тыпу з верт. зваротна-паступальным рухам даўбёжнага разца (даўбяка). Прызначаны для апрацоўкі цяжкадаступных вонкавых і ўнутр. паверхняў, пазоў і канавак (у т.л. нескразных) любога профілю. 2) Дрэваапрацоўчы станок для выбірання прамавугольных і авальных пазоў і адтулін з дапамогай фрэзерных ланцужкоў, полых долатаў або плоскіх разцоў.

ДА́ЎБЛІ, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка, за 12 км на ПдЗ ад г. Браслаў. Уваходзіць у *Браслаўскую групу азёр*. Пл. 1,64 км^2, даўж. каля 4 км, найб. шыр. 610 м,

Да арт. **Даўбёжнае рамяство**. Выдзеўбаны посуд.



Разцы металарэзнага **даўбёжнага станка** (даўбякі): 1 — дыскавы; 2 — чашачны; 3 — утулкавы; 4 — хваставы.

найб. глыб. 25,8 м, даўж. берагавой лініі больш за 12 км. Пл. вадазбору 13,1 км^2. Схілы катлавіны выш. да 15 м, разараныя, у ніжняй ч. параслі хмызняком. Берагі зліваюцца са схіламі, пад хмызняком, месцамі выш. да 1 м, абразійныя. Зарастае слаба. Упадаюць 2 ручаі, выцякае ручай у р. Акунёўка.

ДАЎБЭ Вальдэмар Пятровіч (28.2.1895, хутар Міле Валмієрскага р-на, Латвія — 12.10.1950), савецкі паліт. і ваен. дзеяч. З 1911 працаваў на Віцебшчыне. З 1918 ваен. камісар Віцебскай губ., чл. Віцебскага губкома РКП(б) і губвыканкома, камісар Смаленскай дывізіі (у Віцебску), камісар зводнага Віцебскага атрада, з якім праводзіў ліквідацыю мяцяжоў эсэраў у Оршы і Сянно. З вер. 1918 камісар 1-й Магілёўскай, 24-й «Жалезнай» дывізій. З 1919 на Усх., Туркестанскім франтах. У 1922—24 нач. Віцебскага губ. аддзела АДПУ. Пазней да 1945 на кіруючых пасадах у органах АДПУ, НКУС, НКДБ. Канд. у чл. ЦВК СССР у 1924—25.

ДАЎГАВА, назва р. *Заходняя Дзвіна* ў межах Латвіі.

ДАЎГАВЕ́ЧНАСЦЬ, уласцівасць тэхн. вырабу (прыстасавання, збудавання) захоўваць працаздольнасць да надыходу гранічнага стану, пры якім далейшая эксплуатацыя яго павінна быць спынена з-за неадхільнага парушэння патрабаванняў тэхнікі бяспекі або выхаду параметраў за ўстаноўленыя межы. Адзін з асн. паказчыкаў *надзейнасці* вырабаў. Колькасна ацэньваецца рэсурсам — працягласцю функцыянавання вырабу (або аб'ёмам выкананай ім работы) ад пачатку эксплуатацыі да надыходу гранічнага стану. Для многіх вырабаў (электроннай тэхнікі і інш.) крытэрыем гранічнага стану з'яўляецца прыпыненне дзейнасці (гл. *Безадказнасць*). Д. вызначаецца разлікамі, спец. даследаваннямі з выкарыстаннем *тэхнічнай дыягностыкі*. На Беларусі праблемы Д. вывучаюцца ў Ін-це надзейнасці машын Нац. АН і інш.

ДАЎГАДЗЮ́БЫ КРАХА́ЛЬ, гл. ў арт. *Крахалі*.

ДАЎГАКРЫ́ЛЫЯ, стрыжападобныя (Apodiformes), атрад птушак. 3 сям.: *стрыжы, калібры*, чубатыя стрыжы (Hemiprochidae). Больш за 420 відаў. Пашыраны ўсюды, асабліва ў тропіках. На Беларусі трапляецца стрыж чорны (Apus apus).

Маса 1,6—140 г. Крылы доўгія і вузкія з пакарочанай плечавой косцю і кароткімі другараднымі махавымі пер'ямі, што забяспечвае хуткі манеўраны палёт. Большую ч. дня праводзяць у паветры, на зямлі бездапаможныя, узляцець з роўнай паверхні не могуць. Т-ра цела можа часова зніжацца і птушкі ўпадаюць у здранцвенне. Нясуць 1—6 яец.

ДАЎГА́ЛА Валерый Цімафеевіч (н. 6.6.1947, г. Гомель), бел. мастак-манументаліст. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1972). У 1974—93 і з 1996 на Мінскім маст.-вытв. камбінаце. У 1993—96 нам. старшыні СМ Беларусі. Працуе ў тэхніцы вітража («Свята зямлі беларускай», Дом быту ў Мінску, 1980—81, і інш.), энкаўстыкі («Спадчына», Дом культуры ў в. Лошніца Барысаўскага р-на, 1984—85; «Свята», Дом культуры аб'яднання «Даламіт» у Віцебску, 1986; з А.Яскіным, і інш.), акварэлі (серыі: «Запаляр'е», 1985—86, «Лепельскі край», 1987—88, «Успаміны аб Сан-Сусі», 1989—90; «Святло ў лесе», 1995, і інш.). Аўтар маст. афармлення з У.Стальмашонкам грамадскіх аб'ектаў, адметнага пошукам новых формаў і выкарыстаннем нетрадыц. матэрыялаў (мораны дуб з крышталём у рэстаране «Мінск» у г. Патсдам, Германія, 1976—77) і тэхнік (фларэнційская мазаіка на станцыі метро «Маскоўская», 1979—82; станцыі метро «Плошча Перамогі», 1984 і «Купалаўская», 1987—88, і інш.).

ДАЎГАЛЕ́ЎСКІ Мітрафан (свецкае імя Міхаіл), украінскі і беларускі пісьменнік, культ.-асв. дзеяч 1-й пал. 18 ст. Скончыў Кіеўскую акадэмію (1732). Пастрыгся ў манахі; з 1733 быў выкладчыкам, у 1736—37 прафесарам паэтыкі гэтай акадэміі. Аўтар некалькіх панегірыкаў, школьных драм на біблейскія сюжэты: «Камічнае дзеянне...» (1736) і «Уладатворчае аблічча чалавекалюбства божага» (1737), дадаткам да якіх былі 10 інтэрмедый (аўтарства невядома) пра жыццё ўкр. і бел. сялян, іх нац.-рэліг. барацьбу супраць польскіх паноў. У яго драм. сац.-бытавых творах дзеючыя асобы «літвіны» гавораць на бел. мове.

Тв.: Поетика. (Сад поетичний). Київ, 1973; Комическое дійствіе // Українська література XVIII ст. Київ, 1983. *В.А.Чабаненка.*

ДАЎГАЛЕ́ЦЦЕ, сацыяльна-біялагічная з'ява, якая характарызуецца дажыванням чалавека да высокіх узроставых рубяжоў. Даўгавечнымі наз. людзей, якім

В.**Даўгала**, У.Стальмашонак. Свята зямлі беларускай. Вітраж. 1981.

Адзін з аўтараў комплекснага вырашэння інтэр'ераў Палаца Рэспублікі (з 1986).

ДАЎГАЛЕ́ССЕ, вёска ў Гомельскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 40 км на ПдЗ ад Гомеля, 18 км ад чыг. ст. Якімаўка. 925 ж., 344 двары (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

больш за 90 гадоў. Многія з іх захоўваюць добрую памяць, цікавасць да навакольнага свету і ў значнай ступені працаздольнасць. У іх добра працуе сэрца, эндакрынная сістэма, моцны і ўраўнаважаны тып вышэйшай нерв. дзейнасці; яны ўстойлівыя да стрэсаў і інфекц. хвароб. Вывучае Д. *геранталогія*.

Спрыяюць Д. генет. патэнцыял, спадчын-

насць, сац.-эканам. ўмовы, матэрыяльны дабрабыт, пэўныя псіхічныя і матэрыяльныя перадумовы, фіз. праца, рэжым харчавання, высокі ўзровень грамадскай санітарыі, аховы здароўя, неўжыванне тытуню і алкаголю. На Беларусі найбольш даўгавечнікаў у Віцебскай вобл. *М.Ф.Сарока.*

ДАЎГАЛЁНАК Дзмітрый Аляксандравіч (н. 14.12.1971, Мінск), бел. спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ). Засл. майстар спорту (1992). Чэмпіён Алімпійскіх гульняў на дыстанцыі 500 м (1992, Барселона), чэмпіён свету на дыстанцыі 200 м (1994). Усе поспехі дасягнуты на каноэ-двойцы з А.*Масейкавым.*

ДАЎГАПО́ЛЛЕ, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., на р. Чарноўка. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 16 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Гарадок, 55 км ад Віцебска. 408 ж., 160 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ДАЎГАПО́ЛЬСКІ Цодзік Львовіч (11.8.1879, г. Гарадок Віцебскай вобл. — 16.7.1959), яўрэйскі пісьменнік. Займаўся пед. дзейнасцю, з 1933 працаваў у Дзяржвыдзе БССР. У 1937 незаконна асуджаны (тэрмін адбываў у Казахстане), у 1943 вызвалены. Друкаваўся з 1914. Пісаў на яўр., бел. і рус. мовах. У раманах «Каля адчыненай брамы» (1928, бел. пер. 1931), «Шоўк» (1934), аповесці «Агітпоезд» (1934, бел. пер. 1935) паказаў жыццё яўр. местачковага насельніцтва ў гады станаўлення сав. улады ў Беларусі. Пісаў апавяданні, нарысы, фельетоны, п'есы.

Тв.: На берегах Сылвы. Мн., 1955; На рассвете. Мн., 1957; Пять лепестков. Мн., 1959.

І.Ф.Кудраўцаў.

ДАЎГАПЯ́ТЫ (Tarsius), адзіны род сям. даўгапятых атр. прыматаў. 3 віды: Д. філіпінскі, або сірыхта (T. syrichta), Д. заходні, або банканскі (T. bancanus) і Д.-здань, або ўсходні, ці макі-дамавы (T. spectrum). Пашыраны на а-вах Малайскага архіпелага. Жывуць у трапічных дажджавых лясах, зарасніках кустоў на нізінных участках і па берагах рэк. Усе віды ў Чырв. кнізе МСАП.

Даўж. цела 8—16 см, хваста 13—27 см, маса 80—165 г. Футра густое, шэра-карычневае. Галава вял., паварочваецца на 180°. Вочы вял., ярка-жоўтыя, свецяцца. Вушы голыя, рухомыя. Заднія канечнасці больш доўгія за пярэднія за кошт падаўжэння пятачнай косці (адсюль назва). Кормяцца насякомымі, яшчаркамі. Нараджаюць 1 дзіцяня.

Л.В.Кірыленка.

Даўгапяты:
1 — здань;
2 — заходні.

1 2

ДАЎГАТА́ ГЕАГРАФІ́ЧНАЯ, адна з *геаграфічных каардынат*, якая вызначае становішча якога-небудзь пункта на зямной паверхні. Вымяраецца вуглом паміж плоскасцю пачатковага (грынвіцкага) мерыдыяна і плоскасцю мерыдыяна, які праходзіць праз дадзены пункт. Даўготы на У ад пач. мерыдыяна, ад 0° да 180°, наз. ўсходнімі, на З — заходнімі.

ДАЎГАЎПІ́ЛС (Daugavpils), горад, цэнтр раёна ў Латвіі. 127 тыс. ж. (1992). Прыстань на р. Даўгава. Чыг. вузел. Машынабудаванне і металаапрацоўка, хім., лёгкая, харч. прам-сць; выт-сць буд. матэрыялаў, мэблі і інш. Пед. ін-т. Краязнаўчы і маст. музеі. Тэатр.

Засн. ў 1275 рыцарамі-мечаносцамі як крэпасць Дынабург. З 1559 пад уладай ВКЛ і Польшчы. У 1569 разам з *Інфлянтамі* далучаны да Польшчы. У 1656 заняты рус. войскамі і перайменаваны ў Барысаглебск. Паводле *Андросаўскага перамір'я 1667* вернуты Рэчы Паспалітай. У 17 ст. дасягнуў эканам. росквіту, тут знаходзіліся рэзідэнцыя біскупа інфлянцкага і ваяводы; з 1677 сталіца інфлянцкага княства. З 1772 у складзе Расіі, з 1777 цэнтр павета Полацкай, з 1802 — Віцебскай губ. У 1810—32 пабудавана крэпасць. З 1893 наз. Дзвінскам. З 1920 у складзе Латвіі, перайменаваны ў Д. У 1922—38 у Д. існавала Дзвінская дзярж. бел. гімназія. У Вял. Айч. вайну акупіраваны ням. фашыстамі (1941—44).

ДАЎГАХВО́СТАЯ НЯЯ́СЫЦЬ, гл. ў арт. *Няясыці.*

ДАЎГАХВО́СТАЯ СІНІ́ЦА, гл. ў арт. *Таўстадзюбыя сініцы.*

ДАЎГАХВО́СТЫ ПАМО́РНІК, гл. ў арт. *Паморнікі.*

ДАЎГІ́НАВА, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Вілейка—Докшыцы. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 45 км ад Вілейкі, 120 км ад Мінска, 18 км ад чыг. ст. Крывічы. 1419 ж., 596 двароў (1997).

Вядома з пач. 17 ст. як вотчына кн. Друцкіх-Саколінскіх. З 1625 у Ашмянскім пав. Віленскага ваяв. У 1643 мястэчка, цэнтр кірмашовага гандлю. У 1661 у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 пад Д. адбываліся жорсткія баі. З 1793 у Рас. імперыі. Да 1866 тут працавала суконная ф-ка. У 1897 цэнтр воласці Вілейскага пав., 3551 ж., школа, 60 крам, паштовая станцыя, Станіславаўскі касцёл. У 1921—39 у Вілейскім пав. Польшчы, з 1939 у БССР, з 1940 у Крывіцкім р-не, цэнтр сельсавета. З 1.5.1940 гар. пасёлак. У Вял. Айч. вайну ў Д. адбыўся *Даўгінаўскі бой 1943.* З 1954 вёска, з 1962 у Вілейскім р-не. У 1971 — 1477 ж., 501 двор.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Магілы ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры — Станіславаўскі касцёл (19 ст.) і *Даўгінаўская Троіцкая царква* (2-я пал. 19 ст.). Каля вёскі — гарадзішча штрыхаванай керамікі і банцараўскай культуры.

Даўгінаўская Троіцкая царква.

ДАЎГІ́НАВА, вёска ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., на р. Волта, каля аўтадарогі Міёры—Верхнядзвінск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 17 км на ПдУ ад горада і 19 км ад чыг. ст. Міёры, 198 км ад Віцебска. 258 ж., 91 двор (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ДАЎГІ́НАЎСКАЯ СУКО́ННАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1823—67 у мяст. Даўгінава Вілейскага пав. (цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл.). У 1824 мела 2 ткацкія станкі, у 1840 — 28 станкоў, вадзяны і паравы рухавікі. Сыравіна (воўна, клей, фарбы і інш.) набывалася ў Рызе. Прадукцыя рэалізоўвалася ў Мінску, Вільні, Гродне, Пецярбургу, Рызе, Палтаве. Працавалі прыгонныя і замежныя майстры. У 1861 выпушчана прадукцыі на 66,1 тыс. руб. У 1866 былі 162 рабочыя.

ДАЎГІ́НАЎСКАЯ ТРО́ІЦКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. Пабудавана ў 1886 з цэглы ў в. Даўгінава Вілейскага р-на Мінскай вобл. Храм 4-часткавай падоўжна-восевай кампазіцыі: званіца, трапезная, асн. аб'ём з прыдзеламі, апсіда. Прыдзелы і апсіда вырашаны паўратондамі. 2-ярусная (васьмярык на чацверыку) шатровая званіца надбудавана над прытворам і завершана цыбулепадобнай галоўкай. Над сяродкрыжжам буйны 8-гранны светлавы барабан накрыты самкнутым сферычным купалам. *А.М.Кулагін.*

ДАЎГІ́НАЎСКІ БОЙ 1943, бой партыз. брыгады «Жалязняк» (камандзір І.П.Ціткоў) па разгроме ням.-фаш. гарнізона 26 сак. ў г.п. Даўгінава Крывіцкага р-на Мінскай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Гарнізон быў адным з апорных пунктаў, што прыкрывалі падыход да чыг. Маладзечна—Полацк, базай правядзення карных аперацый, захавання і перапрацоўкі нарабаванай сельгаспрадукцыі. Пасля *Бягомльскай аперацыі 1942* і *Докшыцкага бою 1943* знаходзіўся ў павышанай баявой гатоўнасці. Партызаны для прыкрыцця небяспечных напрамкаў стварылі засады. У 18 гадз пры падтрымцы гармат 3 атрады атакавалі Даўгінава, уварваліся ў цэнтр, знішчылі склады і прадпрыемствы працаўніка. Раніцай 27 сак. партызаны амаль без страт вярнуліся на зборны пункт.

ДА́ЎГМАЛЕ, гарадзішча жал. веку і ранняга сярэднявечча (канец 1-га тыс. да н.э. — канец 12 ст.) у Латвіі. За 22 км на У ад Рыгі, на левым беразе Зах. Дзвіны (Даўгавы). Месца перасячэння заходнядзвінскага шляху з сухапутным шляхам з Пд і Пн, значная ч. якога праходзіла праз Беларусь. Даследаваў у 1966—70 В.А.Уртанс. Знаходкі (сканд., герм., слав., фін., балцкія, візант., араб. вырабы, зах.-еўрап. манеты) даюць падставу сцвярджаць, што Д. было буйным рамесным і гандл. цэнтрам, да 10 ст. належала земгалам, у 11—12 ст. заселена этнічна змешаным насельніцтвам.

ДАЎГУВЕ́ЦІС (Dauguvietis) Барысас (26.3.1885, Даўтувечай Біржайскага р-на, Літва — 13.7.1949), літоўскі рэжысёр, акцёр, драматург. Засл. дз. маст. Літвы (1946), нар. арт. СССР (1948). Скончыў Пецярбургскую тэатр. школу (1909). Да 1921 працаваў у Петраградзе і ў правінцыяльных т-рах Расіі. У 1923—41 рэжысёр і акцёр Дзярж. т-ра ў Каўнасе. З 1944 гал. рэжысёр Драм. т-ра ў Вільні. Для яго пастановак характэрны яркая псіхалагічнасць і эмацыянальнасць: «Атэла» (1924) і «Зімовая казка» (1925) У.Шэкспіра, «Марыя Сцюарт» (1937) і «Каварства і каханне» (1949) Ф.Шылера, «Ворагі» М.Горкага (1947, Дзярж. прэмія СССР 1947). Створаным ім вобразам уласцівы тэмперамент, экспрэсія: Барон («Скупы рыцар» А.Пушкіна), Клаўдзій («Гамлет» Шэкспіра), Нешчасліўцаў («Лес» А.Астроўскага). Аўтар п'ес «Заданне» (паст. ў 1946), «Жалдакіне» (паст. ў 1948).

ДАЎГЯ́ЛА Алег Георгіевіч (1.5.1930, г. Полацк, Віцебскай вобл. — 1.4.1986), бел. вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1968), праф. (1972). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1955), дзе працаваў з 1960. З 1971 у Віцебскім мед. ін-це. Навук. працы па зменах у печані ад ачаговай пнеўманіі, механізмах развіцця сардэчнай недастатковасці, ішэмічнай хваробы, дзеянні вітамінаў на мышцу сэрца ў хворых з недастатковасцю кровазвароту, распрацоўцы бязлекавых метадаў прафілактыкі ішэмічнай хваробы сэрца і артэрыяльнай гіпертэнзіі.

Тв.: Патогенез, клиника и лечение хронической недостаточности кровообращения. Мн., 1974; Ишемическая болезнь сердца: ранняя диагностика и безлекарственная профилактика в поликлинических условиях. Мн., 1986 (разам з Н.М.Федарэнка).

Літ.: Врач, ученый, лектор. Мн., 1984.

А.Даўгяла. Белая вежа. Камянец. 1992.

ДАЎГЯ́ЛА Алег Міхайлавіч (н. 28.7.1940, Мінск), бел. жывапісец. Сын М.Х.*Даўгялы*. Скончыў тэатр.-маст. ін-т (1967). Працуе ў пейзажным і быт. жанрах. Сярод твораў: «Гарадскі пейзаж» (1965), «Клятва партызан» (мазаіка), «Мінск. Кафедральны сабор» (абодва 1967), «Пасля работы» (1970), «Лагойшчына» (1982), «Нясвіжскі замак» (1988), «Тураўская царква» (1990), «Белая вежа. Камянец» (1992), «Касцёл у Сопаце» (1994), «Замак у Гданьску» (1995), «Месячная ноч» (1997) і інш.

М.Даўгяла. Восень. Залаты клён. 1976.

Палітра мастака разнастайная і маляўнічая, работы прасякнуты паэт. успрыманнем прыроды, эмацыянальнасцю.

ДАЎГЯ́ЛА Георгій Хрысанфавіч (9.12.1902, г. Віцебск — 29.7.1974), бел. вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1955), праф. (1956). Засл. дз. нав. Беларусі (1966). Скончыў БДУ (1928). З 1946 у Мінскім мед. ін-це, у 1955—74 заг. кафедры шпітальнай тэрапіі. У 1953—59 гал. тэрапеўт Мін-ва аховы здароўя БССР. Навук. працы па гематалогіі, кардыялогіі, рэўматалогіі, атэрасклерозе, хранічных пнеўманіях, гастраэнтэралогіі.

Тв.: Злокачественное малокровие (болезнь Аддисона — Бирмера). 2 изд. Мн., 1962; Система гемостаза в норме и патологии. Мн., 1973 (разам з У.Л.Крыжаноўскім).

ДАЎГЯ́ЛА Дзмітрый Іванавіч (1.11.1868, в. Казьяны Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. — крас. 1942?), беларускі гісторык, архівіст, археограф, крыніцазнавец. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1894). З 1897 працаваў у Віцебскім, Віленскім архівах стараж. актаў. З 1906 член, з 1912 старшыня *Віленскай археаграфічнай камісіі*, рэдактар «Записок Северо-Западного отдела Русского географического общества», ганаровы чл. *Віцебскай вучонай архіўнай камісіі*. Удзельнік Усебел. з'езда 1917. З 1921 заг. Магілёўскага губ. архіва. З 1925 супрацоўнік Інбелкульта, дацэнт БДУ, з 1929 дырэктар б-кі АН БССР, з 1937 навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР. Аўтар прац па гісторыі гарадоў і мястэчак Беларусі. Першы даследаваў гісторыю і гіст. тапаграфію полацкіх, Барысаўскага, Свіслацкага, Аршанскага замкаў, вывучаў гісторыю нац. меншасцей у Беларусі. Складальнік, рэдактар, удзельнік выдання «*Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў*» (т. 27—32, 1899—1906), *Актаў Віленскай камісіі* (т. 32—37, 1907—12), «*Беларускага архіва*» (т. 1—3, 1927—30), «Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (т. 1, 1936) і інш. 10.12.1937 арыштаваны, 11.9.1939 высланы ў Казахстан на 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1964.

Тв.: З беларускага пісьменства XVII ст. Мн., 1927; Літоўская Метрыка і яе каштоўнасць для вывучэння мінуўшчыны Беларусі. Рыга, 1933. *М.Ф.Шумейка.*

ДАЎГЯ́ЛА Міхаіл Хрысанфавіч (21.5.1908, в. Крутое Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. — 9.9.1978), бел. жывапісец. Брат Г.Х.*Даўгялы*. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930). Выкладаў у Мінскім пед. тэхнікуме (1930—35). Працаваў пераважна ў жанры пейзажа. Сярод твораў: «У Заходняй Беларусі» (1932), «Стары Мінск» (1945), «Батанічны сад у Мінску» (1949), «Лагойскія далі» (1950), «Збор ураджаю» (1956), «Ля вогнішча на Беразіне» (1970), «Восень. Залаты клён» (1976) і інш. Пісаў таксама нацюрморты, партрэты («Партрэт дачкі з кветкамі», 1957). Творы вызначаюцца шчырасцю пачуцця, завершанасцю жывапіснага вобраза.

Літ.: Буйвал В. Пясняр роднай прыро-

ды // Кола дзён: Бел. літ.-маст. каляндар, 88. Мн., 1988.

ДАЎГЯ́ЛА Уладзімір Аляксандравіч (н. 11.5.1947, в. Баршчоўка Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Д-р тэхн. н. (1993). Скончыў Маскоўскі інж.-фіз. ін-т (1971). З 1994 у Бел. ун-це транспарту (г. Гомель). Навук. даследаванні па матэрыяла- і машыназнаўстве. Распрацаваў тэарэт. асновы стварэння новага класа матэрыялаў — высокатрывалых валокнаарміраваных кампазітаў на аснове дысперсных палімераў.

Тв.: Полимерные покрытия. Мн., 1976 (разам з У.А.Белым, А.Р.Юркевічам); Композиционные материалы и покрытия на основе дисперсных полимеров. Мн., 1992 (разам з А.Р.Юркевічам).

ДАЎЖА́НКА, рака ў Бялыніцкім і Клічаўскім р-нах Магілёўскай вобл., правы прыток р. Друць (бас. Дняпра). Даўж. 37 км. Пл. вадазбору 272 км^2. Пачынаецца за 1,5 км на У ад в. Стадолішча Бялыніцкага р-на. Цячэ па паўд.-ўсх. ускраіне Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Асн. прыток — р. Рудка (справа). Даліна невыразная, дробнаўрэзаная, шыр. 1 км. Да в. Доўгае Клічаўскага р-на схілы параслі мяшаным забалочаным лесам, ніжэй адкрытыя. Пойма двухбаковая, лугавая, у верхняй ч. забалочаная. Рэчышча ў вытоку на працягу 5 км каналізаванае, ніжэй звілістае.

ДАЎЖНІ́К, у цывільным працэсе бок абавязацельства (*дэбітор*), які павінен выканаць на карысць другога боку (*крэдытора*) пэўнае дзеянне або ўстрымацца ад такога дзеяння. Д. могуць выступаць асобы, здольныя быць носьбітамі грамадзянскіх правоў і абавязкаў, г.зн. праваздольныя грамадзяне, юрыд. асобы і сама дзяржава. Калі ў абавязацельстве бяруць удзел некалькі Д., кожны з іх павінен выканаць абавязацельства ў роўнай долі з іншымі.

ДАЎЖЫНЯ́ ў геаметрыі, лікавая характарыстыка працягласці лініі.

Д. адрэзка прамой — адлегласць паміж яго канцамі, вымераная адрэзкам, прынятым за адзінку даўжыні. Д. ломанай — сума Д. яе звёнаў. Д. другі крывой лініі — ліміт Д. ломаных, упісаных у гэтую дугу, калі лік звёнаў неабмежавана павялічваецца і Д. найбольшага звяна імкнецца да нуля. Д. S плоскай лініі, зададзенай у прамавугольных каардынатах ураўненнем $y=f(x)$, $a\le x\le b$, дзе $f(x)$ — мае непарыўную вытворную $f'(x)$, вылічаецца па формуле $S=\int_a^b \sqrt{1+[f'(x)]^2}\,dx$. Для прасторавай лініі, зададзенай у параметрычнай форме $x=x(t)$, $y=y(t)$, $z=z(t)$, $\alpha\le t\le\beta$, $S=\int_\alpha^\beta \sqrt{[x'(t)]^2+[y'(t)]^2+[z'(t)]^2}\,dt$.

ДАЎЖЫНЯ́ СВАБО́ДНАГА ПРАБЕ́ГУ, сярэдні шлях, які праходзіць часціца (малекула, атам і г.д.) паміж двума паслядоўнымі сутыкненнямі з інш. часцінкамі. Для звычайных малекулярных газаў пры нармальных умовах Д.с.п. ~0,1 мкм, што прыкладна ў 100 разоў перавышае сярэднюю адлегласць паміж малекуламі. Паняцце «Д.с.п.» ўзнікла ў кінетычнай тэорыі газаў і абагульнена на выпадак слаба ўзаемадзейных часціц, якія ўтвараюць газападобныя сістэмы (электронны газ у металах і паўправадніках, нейтроны ў слаба паглынальным асяроддзі і інш.). Выкарыстоўваецца пры разліках розных працэсаў пераносу (гл. *Пераносу з'явы*).

ДАЎЖЫНЯ́ ХВА́ЛІ, найменшая адлегласць паміж пунктамі сінусаідальнай хвалі, якія вагаюцца ў аднолькавай фазе (зрух фаз роўны 2π). Д.х. α звязана з частатой ν і фазавай скорасцю хвалі c суадносінамі: $\lambda = c/\nu$. Гл. таксама *Хвалі*.

ДАЎЖЭ́НКА Аляксандр Пятровіч (11.9.1894, г.п. Сасніца Чарнігаўскай вобл., Украіна — 25.11.1956), украінскі і расійскі кінарэжысёр, пісьменнік. Засл. дз. маст. Украіны (1939), нар. арт. Расіі (1950). Скончыў Глухаўскі настаўніцкі ін-т (1914). Вучыўся ва Укр. акадэміі мастацтва ў Кіеве (1917—19). У 1926—28 працаваў на Адэскай кінафабрыцы, у 1929—41 — на Кіеўскай студыі маст. фільмаў (з 1957 носіць яго імя), з 1946 — на «Масфільме». Сярод фільмаў: «Сумка дыпкур'ера» (1927), «Звянігара» (1928), «Арсенал» (1929), «Зямля» (1930), «Іван» (1932), «Аэраград» (1935), «Шчорс» (1939), «Мічурын» (1949); дакумент. «Бітва за нашу Савецкую Украіну» (1943) і «Перамога на Правабярэжнай Украіне» (1945, разам з Ю.*Сонцавай*). Фільмы Д. філасофскія, рамантычна прыўзнятыя, паэтычныя, з метафарычнасцю кінамовы, блізкія да традыцый укр. фальклору. Аўтар апавяданняў («Маці», «Перад боем», «Перамога» і інш.), аўтабіягр. аповесці «Зачараваная Дзясна» (выд. 1957), кінааповесцей «Аповесць палымяных гадоў» (1944—45), «Паэма пра мора» (1956). Ленінская прэмія 1959 (пасмяротна), Дзярж. прэміі СССР 1941, 1949.

Дз.І.**Даўгяла**.

А.П.**Даўжэнка**.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1966—69.

Літ.: Марьянов А. Довженко. М., 1968; Уроки Александра Довженко: Сб. ст. Киев, 1982.

ДАЎКАНТА́С (Daukantas) Сіманас (28.10.1793, в. Кальвяй Скуодаскага р-на, Літва — 6.12.1864), літоўскі гісторык, пісьменнік-асветнік. Скончыў Віленскі ун-т (1822). Працаваў у Рызе (1825—34) і Пецярбургу (1835—50). У працах па гісторыі, гісторыі культуры Літвы («Дзеянні старажытных літоўцаў і жамайтаў», 1829; «Лад жыцця старажытных літоўцаў», 1845; «Гісторыя Жамайціі», кн. 1—2, 1893—97) паказаў самабытнасць літ. народа, сцвярджаў яго права на самастойнасць. Складальнік зборнікаў літ. фальклору (1846, 1932), слоўнікаў літ. мовы. Аўтар падручнікаў, кніг па сельскай гаспадарцы.

Тв.: Baštai. T. 1—2. Vilnius, 1976.

ДАЎЛАЦЯ́Н Фрунзе Вагінакавіч (н. 26.5.1927, Ерэван), армянскі кінарэжысёр, акцёр. Нар. арт. СССР (1983). Пачынаў як тэатр. акцёр. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1960). З 1944 здымаецца ў кіно: «Давід-Бек», «Анаіт», «Пра што шуміць рака» і інш. Паставіў фільмы: «Кар'ера Дзімы Горына» (1961) і «Раніншія паязды» (1963, абодва з Л.Мірскім), «Добры дзень, гэта я!» (1966, і роля Зарана; Дзярж. прэмія Арменіі 1967), «Браты Сараяны» (1968, і гал. роля; Дзярж. прэмія Арменіі 1971) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1950.

ДА́ЎМАН Анс Эрнеставіч (26.11.1885, хутар Крэйпі, Рыжскі р-н, Латвія — 2.8.1920), савецкі ваен. дзеяч. Скончыў Пскоўскае каморніцкае вучылішча (1906). Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. З 1914 на фронце, прапаршчык. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 гар. галава, потым старшыня выканкома Нарвенскага Савета, старшыня Нарвенскага ВРК. З 1918 на камандных і паліт. пасадах у Чырв. Арміі. У кастр. 1919 — жн. 1920 чл. РВС 16-й арміі ў Беларусі, адначасова ў чэрв. — ліп. 1920 нач. 10-й стралк. дывізіі, удзельнік вызвалення Пухавіч, Клецка, Чэрвеня, Бярозы, Кобрына, Брэста ад польск. войск. Загінуў у Брэсце. Узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Сцяга.

ДАЎМО́НТ (хрысціянскае імя Цімафей; ? — 20.5.1299), князь нальшчанскі і пскоўскі. У 1263 удзельнічаў у змове жамойцкага кн. Траняты супраць *Міндоўга*. У 1265 пасля заваявання Нальшчанаў навагрудскім кн. *Войшалкам* уцёк з дружынай у Пскоў, дзе ў 1266 прыняў праваслаўе і абраны князем. Паколькі Войшалк аддаў Нальшчаны Полацку, Д. у 1266—67 арганізаваў 3 паходы на Полацкую зямлю. У 1268, 1269, 1272, 1298, 1299 вёў паспяховую барацьбу з крыжакамі, якія нападалі на Пскоўскую зямлю. Кананізаваны правасл. царквой. Статуя Д. ў шматфігурным помніку «Тысячагоддзе Расіі» (скульпт. М.В.Мікешын) у Ноўгарадзе.

М.А.Ермаловіч.

ДАЎНА ХВАРО́БА, храмасомная хвароба, пры якой адставанне ў разумовым і фіз. развіцці спалучаецца са своеасаблівым вонкавым выглядам хворых і недастатковасцю функцый залоз унутр. сакрэцыі (найчасцей шчытападобнай залозы). Апісана англ. урачом Л.Даўнам у 1866. У хворых на Д.х. колькасць хра-

масом у клетках 47 замест 46 (3 замест 2 храмасом 21-й пары). Прыкметы: паменшаныя памеры галавы, вузкія вочныя шчыліны, косы разрэз вачэй, скурныя складкі каля ўнутр. вуглоў вачэй, плоскі твар са скулавымі дугамі, кароткі нос з шырокім пераносам, дэфармаваныя вушы, тоўсты язык, рэдкія зубы, паўадкрыты рот. Ужо на першым годзе жыцця назіраецца адставанне ў развіцці псіхікі (гл. *Алігафрэнія*) і рухальных навыкаў. Дзеці пазней пачынаюць сядзець і хадзіць; тонус іх мышцаў парушаны, аб'ём рухаў у суставах павялічаны, палавыя органы недаразвітыя. Лячэнне малаэфектыўнае. Навучанне ў спец. школах.

ДАЎНАРАС (Daunoras) Вацлавас (н. 1.2.1937, г. Жагарэ, Літва), літоўскі спявак (бас). Нар. арт. СССР (1986). Скончыў Літ. кансерваторыю (1962), з 1968 выкладае ў ёй (праф. з 1983). Стажыраваўся ў т-ры «Ла Скала» (1966—68). З 1960 (з перапынкамі) саліст Літ. т-ра оперы і балета. Сярод партый: Бжастоўскі («Горад сонца» А.Рачунаса), Маргірыс («Піленай» В.Кловы), Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно), Філіп II («Дон Карлас» Дж.Вердзі), Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Грэмін («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага). Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя М.Глінкі (1962), Міжнар. конкурсу імя П.Чайкоўскага (Масква, 1966), Гран пры конкурсу вакалістаў у Тулузе (1971, Францыя).

ДАЎНАСЦЬ у праве, установленыя законам тэрмін, сканчэнне якога цягне юрыд. вынікі: страту права на іск (іскавая Д.), на прымусовае выкананне рашэння суда, арбітражу і да т.п. (выканаўчая Д.), выключэнне крымін. адказнасці або магчымасці выканання абвінаваўчага прыгавору.

Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь цячэнне іскавай Д. звычайна пачынаецца з дня ўзнікнення права на іск, Д. для прыцягнення да крымін. адказнасці — з дня ўчынення злачынства, Д. прывядзення ў выкананне абвінаваўчага прыгавору ці суд. рашэнняў па цывільных справах — з часу набыцця імі законнай сілы. Агульны тэрмін іскавай Д. ўстанаўліваецца ў 3 гады (для асобных яе відаў закон прадугледжвае спец. тэрміны Д.). Пры наяўнасці законных падстаў цячэнне тэрмінаў іскавай Д. можа прыпыняцца або перарывацца.

Тэрміны Д. прыцягнення да крымін. адказнасці і выканання абвінаваўчага прыгавору дыферэнцыраваны законам і залежаць ад цяжкасці злачынства і назначанага судом пакарання. У такіх выпадках ён доўжыцца ад 1 да 10 гадоў з моманту ўчынення злачынства ці асуджэння. Цячэнне Д. перарываецца або прыпыняецца, калі да сканчэння гэтых тэрмінаў вінаваты зробіць новае злачынства ці асуджаны ўхіліцца ад адбывання пакарання або зробіць новае злачынства. Вылічэнне Д. ў такіх выпадках пачынаецца з моманту ўчынення новага злачынства або затрымання асуджанага. Асоба не можа быць прыцягнута да крымін. адказнасці, калі з моманту ўчынення злачынства мінула 15 гадоў і Д. не была перарвана ўчыненнем новага злачынства. Прымяненне Д. да асобы за злачынства, за якое паводле закону можа быць назначана пакаранне смерцю, вырашае суд. У адпаведнасці з міжнар. канвенцыяй Д. крымін. праследавання не ўжываецца да ваен. злачынцаў.

С.У.Скаруліс.

ДАЎНІНГ-СТРЫТ (Downing Street), вуліца ў цэнтры Лондана, на якой размешчаны рэзідэнцыя прэм'ер-міністра, міністэрства замежных спраў і па справах Супольнасці. Назва «Д.-с.» часта ўжываецца ў прэсе як сімвал урада Вялікабрытаніі.

ДАЎЭС (Dawes) Чарлз Гейтс (27.8.1865, г. Марыета, штат Агайо, ЗША — 23.4.1951), палітычны і дзярж. дзеяч ЗША. Адвакат, пасля банкір. Член Рэсп. партыі. У 1921—22 дырэктар бюджэтнага бюро. У 1923—24 старшыня міжнар. к-та экспертаў па распрацоўцы рэпарацыйнага плана для Германіі (гл. *Даўэса план*). У 1925—29 віцэ-прэзідэнт ЗША. У 1929—32 пасол у Вялікабрытаніі. Нобелеўская прэмія міру 1925 (разам з Дж. *Чэмберленам*).

Ч.Даўэс.

ДАЎЭСА ПЛАН, план забеспячэння выплаты рэпарацый Германіяй, устаноўлены для яе дзяржавамі-пераможцамі (ЗША, Вялікабрытанія, Францыя пасля 1-й сусв. вайны). Распрацаваны ў 1923—24 міжнар. к-там экспертаў на чале з Ч.*Даўэсам* (адсюль назва). Зацверджаны 16.8.1924 на спец. канферэнцыі ў Лондане. Прадугледжваў выдаткаванне Германіі пазыкі ў памеры 200 млн. дол. (у т.л. 110 млн. банкамі ЗША) для стабілізацыі яе валюты (маркі), устанаўленне кантролю саюзных дзяржаў над герм. дзярж. бюджэтам, грашовым абарачэннем, крэдытам і чыгункамі, вызначыў памеры плацяжоў Германіяй у першыя 5 гадоў па 1—1,75 млрд. марак у год, потым па 2,5 млрд. марак у год. Прыняцце Д.п. садзейнічала паскарэнню вываду франц. і бельг. войск з Рура пасля *рурскага канфлікту 1922—23*, павелічэнню замежных інвестыцый у эканоміку Германіі і, як вынік, аднаўленню герм. эканам. патэнцыялу. У 1930 заменены *Юнга планам*.

ДАФАМІ́Н, 3,4-дыоксіфенілэтыламін, медыятар нерв. сістэмы з групы катэхоламінаў, нейрагармон, $C_6H_3(OH)_2CH_2CH_2(NH_2)$. У многіх беспазваночных нейроны, якія выкарыстоўваюць Д. як медыятар (дафамінэргічныя), часта канцэнтруюцца ў перыферычных чуллівых утварэннях, у больш высокаарганізаваных прадстаўнікоў уключаюцца ў склад цэнтр. гангліяў (інтэрнейроны). Дафамінэргічныя нейроны пазваночных утвараюць некалькі скопішчаў, пераважна ў сярэднім мозгу і гіпаталамусе, ёсць у нюхальных цыбулінах і сятчатцы. Д. — прадуцэнт храмафінных клетак, радзей — клетак іншага паходжання (напр., клеткі злучальнай тканкі ў жвачных). Функцыя Д. ў міжклетачных узаемадзеяннях ажыццяўляецца праз дафамінавыя рэцэптары.

ДАФІ́Н (франц. dauphin), з 12 ст. тытул феад. уладальнікаў графстваў Аверні і В'енуа (пазней Дафінэ). Пасля далучэння тэр. Дафінэ да ўладанняў франц. караля (сярэдзіна 14 ст.) Д. — тытул наследніка франц. прастола. Адменены ў 1830.

ДАФІНЭ́ (Dauphiné), гістарычная вобласць і сучасны эканам. раён на ПдУ Францыі, гал. ч. у Альпах і ў даліне р. Рона. Уключае дэпартаменты Ізер, Дром, Верхнія Альпы. Пл. 20,4 тыс. км². Нас. каля 1,5 млн. чал. (1994). Гал. горад — *Грэнобль*. Рэльеф пераважна горны. Клімат умераны, вільготны, у гарах халодны. Ападкаў каля 900 мм за год. На базе гідраэнергетыкі (ГЭС на Роне і Ізеры) развіты электрахімія і электраметалургія. Прам-сць: маш.-буд., тэкст., абутковая, харч., дрэваапр., папяровая (цэнтр Грэнобль і Валанс); цэнтр атамнай прам-сці — г. П'ерлат. Пасевы збожжавых, вінаградарства, садоўніцтва, агародніцтва, пераважна ў далінах. У гарах малочная жывёлагадоўля, авечкагадоўля. Турызм і горны спорт.

ДА́ФНА, у старажытнагрэчаскай міфалогіі німфа, дачка багіні зямлі *Геі* і рачнога бога Пенея. Яна дала зарок захаваць цнатлівасць і бясшлюбнасць. Калі за ёю пагнаўся закаханы *Апалон*, Д. паклікала на дапамогу бацьку і ён ператварыў дачку ў лаўровае дрэва. Лаўр стаў любімай і свяшчэннай раслінай Апалона. На міф пра Д. напісана паэма «Метамарфозы» Авідзія, творы жывапісцаў Джарджоне, Н.Пусэна, Дж.Цьепала, кампазітараў Г.Шутца, А.Скарлаці і інш.

ДАФНІІ, вадзяныя блохі (Daphnia), род прэснаводных беспазваночных падатр. галінаставусых ракападобных. 26 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя палярных абласцей. Жывуць у вадаёмах або ў зараснікаў сажалак, азёр. На Беларусі 4 віды, найб. трапляюцца Д. звычайная (D. pulex) і Д. даўгахвостая (D. longispina).

Цела (даўж. 0,7—6 мм) укрыта празрыстай акругленай двухстворкавай ракавінай. На га-

лаве шчыток з дзюбкай і фасетачнае вока, у некат. і наўпліяльнае вочка. Вусікі (антэны) — органы пачуцця і перамяшчэння. Грудзі з 4—6 сегментаў, кожны з парай ног. Раздзельнаполыя. Летнія пакаленні — самкі, якія размнажаюцца без апладнення (партэнагенез). Увосень з'яўляюцца самцы, адбываецца апладненне. Жывяцца бактэрыямі, аднаклетачнымі водарасцямі, дэтрытам. Д. штучна гадуюць на корм рыбам у рыбных гаспадарках і акварыумах. *Л.В.Кірыленка.*

ДА́ФНІС, у грэчаскай міфалогіі сіцылійскі пастух незвычайнай прыгажосці, стваральнік пастухоўскіх песень. Лічыўся сынам *Гермеса* і німфы. Паводле адных міфаў, памёр ад безнадзейнага кахання, паводле другіх — быў аслеплены закаханай німфай за здраду і ў адчаі кінуўся са скалы ў мора. Міф пра Д. выкарыстоўваўся ў ант. л-ры (Феакрыт, Вергілій, Лонг) і ў букалічнай паэзіі 17—18 ст.

ДАХ (ням. Dach праз польск. dach), канструкцыйная сістэма перакрыцця і

Апалон і **Дафна**. Л.Берніні. 1622—24.

пакрыцця верхняй ч. пабудовы. Д. традыц. жылых і гасп. сялянскіх пабудоў называюць *страхой*. На Беларусі са старажытнасці вядомы Д. каркаснай і *вянковай канструкцыі*. Сярод тыпаў каркасных Д. найб. дасканалы крокавенны, з паяўленнем якога свабодныя ад нагрузкі шчыты набылі значэнне важных элементаў арх. дэкору. Акрамя 2-схільных і пірамідальных формаў з 16 ст. пачалі пашыравацца вальмавыя (з залобкамі, прычолкамі, *дымнікамі*) і 3-схільныя, а з 17 ст. — ламаныя, ярусныя, мансардавыя Д. Для класіцыстычных пабудоў характэрны Д. невысокія, з *франтонамі*. Найб. пашыраны матэрыял пакрыцця — дранка, *гонта*, чарапіца, бляха, шыфер. У сучасным індустр. буд-ве часцей выкарыстоўваюць плоскі Д., сумешчаны з жалезабетоннымі панэлямі перакрыцця. *С.А.Сергачоў.*

ДА́ХАВЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ, будаўнічыя матэрыялы, з якіх робяць *дахі* будынкаў і збудаванняў. Характарызуюцца воданепранікальнасцю, мароза-, вогне- і вільгацеўстойлівасцю, трываласцю, лёгкасцю.

Адрозніваюць Д.м.: цвёрдыя (штучныя — лісты, плітки), гнуткія (рулонныя, найб. пашыраны) і пластычныя (масцікавыя); сілікатныя (азбестацэментныя хвалепадобныя лісты і плітки, гл. *Азбестацэментныя вырабы і канструкцыі*; *чарапіца*, *шыфер*); арганічныя (драўняныя — *гонта*, драніцы, дошкі; бітумныя і дзёгцевыя — *пергамін*, *руберойд*, *толь*; палімерныя на аснове пластмас — плоскія і хвалепадобныя пліты з *шклапластыкаў* і

Дафнія звычайная.

інш.); металічныя (лісты дахавай сталі, алюмінію, цынку). Пластычныя Д.м. — бітумныя, бітумна-палімерныя і дзёгцевыя *масцікі*.

ДА́ХАВЫЯ РАБО́ТЫ, работы па стварэнні *даху* будынкаў і збудаванняў. Склад іх залежыць ад віду і вугла нахілу даху, *дахавых матэрыялаў*.

Звычайна Д.р. ўключаюць: падрыхтоўку (ачыстку, грунтоўку) асновы; параізаляцыю асн. канструкцыі пакрыцця слоем масцікі або 1—2 слаямі пергаміну, руберойду, толі, шклорубероиду (на гарачых і халодных масціках); цеплаізаляцыю з плітавых, маналітных або сыпкіх уцяпляльнікаў; стварэнне выраўноўвальнага слоя — т.зв. сцяжкі (цэментна-пясчанай, асфальтабетоннай); укладку дахавага пакрыцця з 2—5 слаёў рулонных матэрыялаў або масцік, арміраваных шкловалакном, і ахоўнага слоя. Пры выкарыстанні штучных матэрыялаў насцілаюць (укладваюць) азбестацэментныя лісты і плітки, чарапіцу, дахавую сталь на драўляныя латы, жалезабетонныя, стальныя або драўляныя бэлькі.

ДАХА́У (Dachau), канцэнтрацыйны лагер на тэр. Германіі ў 1933—45. Створаны на ўскраіне г. Дахаў (17 км ад Мюнхена). Першапачаткова тут былі зняволены паліт. праціўнікі нацысцкага рэжыму (камуністы, сацыял-дэмакраты, апазіц. свяшчэннікі і інш.). У 2-ю сусв. вайну ў лагеры, які меў каля 125 аддзяленняў і т.зв. знешніх камандаў на ваен. прадпрыемствах Паўд. Германіі і Аўстрыі, праводзіліся злачынныя мед. эксперыменты на вязнях. За час існавання праз лагер прайшло каля 250 тыс. вязняў з 24 краін, загінула 148 тыс. чал. 28.4.1945, напярэдадні з'яўлення войск ЗША, дзеючая ў лагеры інтэрнац. падп. арг-цыя Супраціўлення падняла паўстанне, дзякуючы чаму засталіся жывымі 30 тыс. апошніх вязняў. У 1945—47 камендант, ахоўнікі лагера і медыкі-злачынцы асуджаны ў Нюрнбергу. У 1965 у Д. адкрыты мемар. комплекс (музей, малітоўныя дамы, помнікі); у 1984 уключаны ЮНЕСКА ў спіс аб'ектаў, якія знаходзяцца пад асаблівай аховай.

ДАХЛА́К, архіпелаг у паўд.-зах. ч. Чырвонага м., належыць Эфіопіі. Буйныя а-вы: Д. (750 км^2), Нора (130 км^2); больш за 130 дробных астравоў. Абкружаны каралавымі рыфамі. Пальмавыя гаі. Лоўля чарапах, акул, здабыча жэмчугу і перламутру. Гал. горад і порт — Нокра (на в-ве Дахлак).

ДАХЛО́ЎКА, рака ў Пружанскім і Кобрынскім р-нах Брэсцкай вобл., правы прыток р. Мухавец (бас. Зах. Буга). Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 226 км^2. Пачынаецца каля паўд. ускраіны в. Паддубна (Пружанскі р-н). У верхнім цячэнні наз. Гарадзечна. Рэчышча каналізаванае амаль на ўсім працягу.

ДАХЛЯКО́Ў Аляксандр Дзмітрыевіч (н. 26.1.1942, в. Цютчава Тамбоўскай вобл., Расія), бел. спартсмен (веласіпедны спорт). Майстар спорту міжнар. класа (1965). Пераможца Велагонкі Міру ў камандным (1965—66), сярэбраны прызёр у асабістым (1966) пяршынствах. Чэмпіён СССР у групавой і камандной гонках на 100 км (1966).

ДАХНА́РКА, рака ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Дрыса (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 208 км^2. Выцякае з воз. Белае, цячэ ў забалочанай мясцовасці па Полацкай нізіне, працякае праз воз. Дахнарскае. Асн. прыток р. Лонніца (справа). Даліна ў ніжнім цячэнні добра выражаная, шыр. 200—300 м.

ДАХНА́РСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дахнарка (працякае праз возера) за 14 км на Пд ад г. Полацк. Пл. 0,47 км^2, даўж. 890 м, найб. шыр. 700 м, найб. глыб. 1,7 м, даўж. берагавой лініі каля 2,7 км. Пл. вадазбору 73,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 2—3 м, параслі лесам, на Пд разараныя. Берагі пераважна сплавінныя, на Пн забалочаныя. Дно плоскае, выслана сапрапелем. Зарастае.

ДАХО́Д, грашовая сума, якая рэгулярна і законным шляхам паступае ў непасрэднае распараджэнне суб'екта эканомікі. Галоўныя крыніцы Д. — заработная плата, прадпрымальніцкі прыбытак, арэндная плата, асабістая дапаможная гаспадарка, розныя дзярж. выплаты і інш. Гл. таксама *Дзяржаўныя даходы*, *Даходы насельніцтва*, *Даходы прадпрыемства*, *Нацыянальны даход*.

ДАХО́Д НАЦЫЯНА́ЛЬНЫ, гл. *Нацыянальны даход*.

ДАХО́ДНЫ ДОМ, гарадскі шматкватэрны дом, прызначаны для здачы кватэр у наём. У Еўропе з'явіліся ў 1830—40-я г., у пач. 20 ст. — адзін з асн. тыпаў *жылля* гараджан. У Беларусі існавалі з 1870-х г. да 1917. У пач. 20 ст. будаваліся 3—5-павярховыя Д.д. секцыйнага (найб. пашыраныя), калідорнага, галерэйнага і мяшанага тыпаў; на 1-м паверсе былі гандл. ўстановы. Іх архітэктура часцей мела эклектычны характар. Багацціем арх. афармлення вызначаліся Д.д. па вуліцах Захар'еўскай, Падгорнай, Валадарскага ў Мінску, Шклоўскай, Румянцаўскай у Магілёве, Савецкай у Гомелі і інш. У буд-ве ўдзельнічалі арх. В.Вукалаў, С.Гейдукевіч, Г.Гай, П.Кальнін, С.Краснапольскі, С.Шабунеўскі і інш.

В.М.Чарнатаў.

аплату жыллёва-камунальных паслуг, пуцёўкі ў санаторыі ці дамы адпачынку, утрыманне дзяцей у дашкольных установах, чысты прыбытак ад асабістай дапаможнай гаспадаркі, індывідуальнай прац. дзейнасці. У агульны аб'ём даходаў уключаецца кошт ільготнага і бясплатнага спажывання матэрыяльных даброт і паслуг (кошт адукацыі, мед. дапамогі і інш.). Р э а л ь н ы я Д.н. — паказчык узроўню жыцця насельніцтва, задавальнення яго патрэб. Г р а ш о в ы я Д.н. — частка сукупных Д.н.

ДАХО́ДЫ ПРАДПРЫЁМСТВА, грашовыя паступленні ад вытворчай і невытворчай дзейнасці за вылікам затрат на яе ажыццяўленне. Крыніца фарміравання даходаў — выручка ад рэалізацыі прадукцыі асн. вытв-сці, а таксама ад выканання работ і аказання паслуг паза вытв-сцю, якія аплачаны пакупніком і заказчыкам. Крыніцай пазарэалізацыйных даходаў служаць дывідэнды на

ДАХТУРО́Ў Дзмітрый Сяргеевіч (12.9.1759—26.11.1816), расійскі ваен. дзеяч. Ген. ад інфантэрыі (1810). Скончыў Пажаскі корпус у Пецярбургу (1781), служыў у гвардыі. Удзельнік рус.-швед. вайны 1788—90, Аўстэрліцкай бітвы (1805), Фрыдландскай бітвы (1807). У вайну 1812 камандзір 6-га пях. корпуса ў складзе 1-й Зах. арміі, вывеў яго з акружэння ў раёне Ліды (чэрв. 1812), удзельнік *Смаленскай аперацыі 1812, Барадзінскай бітвы 1812* і інш. У час замежных паходаў рускай арміі 1813—14 і 1815 камандаваў рас. войскамі ў Варшаўскім герцагстве (з сак. 1813), корпусам у складзе Польскай арміі (з ліп. 1813) і інш., вызначыўся ў Лейпцыгскай бітве 1813.

Літ.: Р о м а н о в Д.М. Полководец Д.С.Дохтуров. Тула, 1979.

ДА́ЦКА-ПРУ́СКАЯ ВАЙНА́ 1848—50, вайна Прусіі супраць Даніі за валоданне герцагствамі Шлезвіг і Гольштэйн, звязанымі з Даніяй асабістай уніяй. У на-

Да арт. **Даходны дом**. Жылы дом на вул. Валадарскага ў Мінску.



Да арт. **Даходны дом**. Жылы дом на вуліцы Савецкай у Гомелі.

ДАХО́ДЫ ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ, гл. *Дзяржаўныя даходы.*

ДАХО́ДЫ НАСЕ́ЛЬНІЦТВА, колькасць матэрыяльных і культ. даброт, якія можа атрымаць насельніцтва (асобныя сац. групы, асобныя сем'і) за кошт сваіх грашовых даходаў, бясплатных выплат і льгот; асн. паказчык яго дабрабыту. Характарызуе частку *нацыянальнага даходу*, якая выкарыстоўваецца на асабістае спажыванне. Залежаць ад памераў грашовых Д.н., узроўню цэн на спажывецкія тавары і паслугі, памераў плацяжоў насельніцтва ў фін. сістэму. Адрозніваюць сукупныя, асабістыя, намінальныя, рэальныя, распараджальныя Д.н. С у к у п н ы я Д.н. — агульная сума (у грашовай і натуральнай форме) даходаў, атрыманых насельніцтвам у якасці аплаты за працу па найме, ад уласнасці, прадпрымальніцтва, пенсій, стыпендый, дапамог, датацый на

ўкладзеныя паі, набытыя акцыі і інш. каштоўныя паперы, а таксама штрафы, атрыманыя ад контрагентаў, і інш. непланавыя даходы. Адрозніваюць таксама валавы і гасп.-разліковы Д.п. Валавы Д.п. вызначаецца як розніца паміж аб'ёмам выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, выкананых работ і паслуг і велічынёй матэрыяльных і прыраўнаваных да іх затрат (амартызацыйных адлічэнняў і адлічэнняў органам сац. страхавання). Частка валавога даходу па ўстаноўленых нарматывах накіроўваецца ў дзярж. бюджэт, вышэйстаячай арг-цыі, банку у форме платы працэнтаў за карыстанне пазык. Астатняя частка выступае як гасп.-разліковы даход, г.зн. даход, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемства. Гасп.-разліковы даход з'яўляецца крыніцай і паказчыкам для ўтварэння па вызначаных нарматывах фондаў развіцця вытв-сці, навукі, тэхнікі, фонду сац. развіцця і фонду аплаты працы.

сельніцтве герцагстваў пераважалі немцы, таму пад уплывам рэвалюцыі 1848—49 у Германіі ў герцагствах 21.3.1848 адбылося антыдацкае паўстанне, 23 сак. створаны часовы ўрад, які абвясціў іх незалежнасць і вайну Даніі. Шлезвіг-гальштэйнскія апалчэнцы на чале з ген. А.Кронам занялі крэпасці Рэндсбург і Фленсбург, аднак 9 крас. разбіты дацкімі войскамі каля Бау і адкінуты за р. Айдэр. 6 крас. на дапамогу паўстанцам прыйшлі прускія і саксонска-гановерскія войскі (каля 35 тыс. чал.) на чале з прускім ген. Ф.Урангелем, якія 23 крас. перамаглі 30-тысячную дацкую армію ген. Ф.Бюлава каля г. Шлезвіг і ў пач. мая занялі крэпасць Фрэдэрысія на п-ве Ютландыя. Баі на сушы прыпынены 26 жн., калі Прусія ва ўмовах блакады яе гаваней дацкім ВМФ і дыпламат. націску з боку Вялікабрытаніі, Францыі, Швецыі, Расіі (апошняя ў ліп. дэманстратыўна пры-

слала эскадру ў дацкія воды) падпісала ў г. Мальмё (Швецыя) перамір'е, паводле якога герцагствы вернуты Даніі, а іх урад распушчаны. 3.4.1849 Прусія аднавіла ваен. дзеянні, у ходзе якіх яе войскі (каля 40 тыс. чал.) зноў занялі герцагствы і ў канцы крас. ўступілі ў Ютландыю. Дыпламат. дэмаршы Вялікабрытаніі і Францыі, паўторны выхад у мора рас. эскадры і паражэнне шлезвіг-гольштэйнскіх паўстанцаў 6 ліп. каля Фрэдэрысіі прымусілі Прусію заключыць 10.7.1849 другое перамір'е. 2.7.1850 у Берліне падпісаны мірны дагавор, паводле якога адноўлены даваен. межы Даніі і былы статус герцагстваў; іх апалчэнне на чале з ген. В.Вілізенам спрабавала працягваць вайну, аднак 25.7.1850 разбіта датчанамі і расфарміравана.

ДА́ЦКАЯ ВАЙНА́ 1864, аўстра-пруска-дацкая вайна, вайна Прусіі ў саюзе з Аўстрыяй супраць Даніі за валоданне герцагствам Шлезвіг. Ініцыявана прускім прэм'ер-міністрам О.*Бісмаркам* пасля таго, як Данія ў ліст. 1863 пашырыла сваю канстытуцыю на пераважна нямецкамоўны Шлезвіг, што парушала яго аўтаномны статус. У снеж. 1863 прускія, аўстр., а таксама саксонскія і гановерскія войскі занялі найбліжэйшыя да Шлезвіга герцагствы Гольштэйн і Лаўэнбург, якія ўваходзілі ў Герм. саюз. Данія не прыняла пруска-аўстр. ультыматум ад 16.1.1864 аб скасаванні сваёй канстытуцыі ў Шлезвігу. 1.2.1864 каля 60 тыс. пруска-аўстр. войскоўцаў пад камандаваннем прускага ген.-фельдмаршала Ф.Урангеля атакавалі гал. сілы 38-тысячнай дацкай арміі ген.-лейт. К. дэ Меца ў раёне Даневірке на Пд ад г. Шлезвіг. У ходзе баёў у лют.—крас. дацкія войскі адступілі ў глыб п-ва Ютландыя. 29 чэрв. пруска-аўстр. часці (з мая камандуючы прынц Фрыдрых Карл) аднавілі наступленне і да 14 ліп. акупіравалі ўсю Ютландыю. 30 кастр. ў Вене падпісаны мірны дагавор, паводле якога Данія адмовілася ад прэтэнзій на Шлезвіг і ён стаў сумесным уладаннем Прусіі і Аўстрыі.

ДА́ЦКАЯ МО́ВА, адна з *германскіх моў* (скандынаўская падгрупа). Афіц. мова Даніі (у 16—17 ст. і Нарвегіі). Пашырана таксама на Фарэрскіх а-вах, у Грэнландыі і ЗША. Мае 3 групы дыялектаў: зах. (ютландскія, або ютскія), астраўныя (а-вы Зеландыі, Фюн і прылеглыя да іх), усх. (в-аў Борнхальм і інш.). Гісторыю Д.м. падзяляюць на 2 перыяды: стараж.-дацкі (9—15 ст.) і новадацкі (з 16 ст.).

Гал. асаблівасці Д.м.: у фанетыцы наяўнасць агубленых галосных пярэдняга раду, шматлікія дыфтонгі, значныя камбінаторныя змяненні зычных, накарэнны націск; у марфалогіі — вызначэнне 2 родаў (агульнага і сярэдняга), 2 склонаў, складаная сістэма часоў і ладоў дзеяслова, нязменнасць яго па асобах; у лексіцы — шмат запазычанняў з ням., франц., англ. моў. Пісьменства на аснове лац. алфавіту. Найб. стараж. помнікі — надпісы 9—11 ст. («Малодшыя руны», гл. ў арт. *Руны і рунічныя алфавіты*), рукапісы стараж.-дацкіх абл. законаў 13—14 ст. У 1495 з'явілася першая друкаваная кніга.

ДА́ЦКІ ПРАЛІ́Ў, праліў паміж а-вамі Грэнландыя і Ісландыя. Злучае Грэнландскае м. з Атлантычным ак. Даўж. каля 530 км, шыр. 287 км, найменшая глыб. на фарватэры 120 м. Праз Д.п. уздоўж берагоў Грэнландыі з Пн на Пд праходзіць халоднае Усх.-Грэнландскае цячэнне, уздоўж берагоў Ісландыі з Пд на Пн — галіна цёплага Ірмінгера цячэння.

ДА́ЦКІЯ ПРАЛІ́ВЫ, Балтыйскія пралівы, сістэма праліваў паміж п-вамі Скандынаўскі і Ютландыя. Злучае Балтыйскае м. з Паўночным м. Уключае пралівы *Малы Бельт*, Вялікі Бельт, *Эрэсун*, *Катэгат* і *Скагерак*. Д.п. — асн. шлях, які злучае парты Балтыйскага м. з партамі Сусв. акіяна.

ДАЦЫ́Н, нафтавае радовішча на ПнУ Кітая, у даліне р. Сунгары, у прав. Хэйлунцзян. Адкрыта ў 1959, распрацоўваецца з 1961. Пачатковыя запасы нафты каля 2 млрд. т. Паклады на глыб. 300—3000 м. Шчыльн. нафты 870 кг/м^3. Нафта перапрацоўваецца на з-дзе ў г. Аньда, транспартуецца па нафтаправодах у гарады Далянь, Цыньхуандао і Пекін.

ДАЦЫ́Т (ад лац. Dacia Дакія), магматычная горная парода, эфузіўны аналаг *гранадыярытаў* і кварцавых *дыярытаў*. Складзена з тонказярністай або шкліста-стай асн. масы і ўкрапленняў плагіяклазу, кварцу, рагавой падманкі і інш. Структура парфіравая або афіравая. Колер светла-шэры, зеленавата-шэры, чырванаваты. Шчыльн. 2650 кг/м^3. Д. вядомы ў вулканагенных тоўшчах усіх узростаў, асабліва ў кайназойскіх. Буд. матэрыял.

ДАЦЭ́НТ [ад лац. docens (docentis) той, хто навучае], вучонае званне і пасада выкладчыка вышэйшых навуч. устаноў шэрагу краін. У Рэспубліцы Беларусь прысвойваецца кандыдатам навук або высокакваліфікаваным спецыялістам без вучонай ступені, якія маюць пэўны стаж выкладчыцкай работы ў ВНУ, навук. працы, вынаходствы. У некаторых замежных краінах (Аўстрыі, Балгарыі, Швецыі і інш.) званне Д. прысвойваецца, як правіла, асобам, якія маюць вучоную ступень *магістра*.

ДА́ЧА, 1) дом у загараднай мясцовасці для летняга адпачынку гараджан. 2) Участак зямлі пад лесам, лясная дзялянка.

ДАШАНКО́Ў Віталій Міхайлавіч (н. 23.7.1931, г. Арол, Расія), бел. вучоны ў галіне акустаэлектронікі і тэхн. электрадынамікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1972), праф. (1974). Скончыў Саратаўскі дзярж. ун-т (1954), там і працаваў. З 1974 у Бел. дзярж. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па вагальных і каналізавальных сістэмах ЗВЧ, звязаных сістэмах, перыядычных хваляводах. Распрацаваў новыя тыпы запавольвальных сістэм, тэлевізійныя фільтры на паверхневых акустычных хвалях, фільтры спец. прызначэння.

Тв.: Измерение параметров замедляющих систем методом связанных линий. Ч. 1—3. Вопросы радиоэлектроники. Сер. 1. Эмктроника. 1968. № 9—11; Субоптимальный метод синтеза фильтров на поверхностных акустических волнах // Радиоэлектроника. 1985. № 9. (разам з А.С.Рухленкам).

ДА́ШКАВА Кацярына Раманаўна (28.3.1743, С.-Пецярбург — 16.1.1810), дзеяч рус. культуры. Княгіня. Дачка графа Р.І.Варанцова (гл. ў арт. *Варанцовы*). Удзельніца дварцовага пераваротy 1762, які прывёў на прастол *Кацярыну II*. У 1769—71 і 1776—82 за мяжой; сустракалася з Вальтэрам, А.Смітам, Д.Дзідро. У 1783—96 дырэктар Пецярб. АН і прэзідэнт Рас. акадэміі (навук. цэнтра па вывучэнні рус. мовы і славеснасці). Заснавала перыяд. выданні «Собеседник любителей российского слова» (1783—84) і «Новые ежемесячные сочинения» (1786—96). Па ініцыятыве Д. і пры яе актыўным удзеле выдадзены «Слоўнік Акадэміі Расійскай» (т. 1—6, 1789—94) — першы тлумачальны слоўнік рус. мовы. У 1796 Павел I адхіліў Д. ад спраў. Аўтар літ. твораў у розных жанрах, у т.л. мемуараў (выд. 1859). З 1782 валодала землямі ў Магілёўскай губ. (мяст. Круглае, сёлы Радча, Комсенічы, Ількавічы і 19 вёсак).

К.Р.**Дашкава**. Партрэт Дз.Лявіцкага. 1780-я г.

Тв.: Рус. пер. — Записки... М., 1987.

Літ.: Лозинская Л.Я. Во главе двух академий. 2 изд. М., 1983; Письма сестер М. и К.Вильмот из России: Пер. с англ. // Дашкова Е.Р. Записки... М., 1987; Памяць: Круглянскі р-н. Мн., 1996.

ДА́ШКАЎКА, вёска ў Магілёўскім р-не, на правым беразе р. Дняпро, на аўтадарозе Магілёў—Быхаў. Чыг. станцыя на лініі Магілёў—Жлобін. Цэнтр сельсавета, калгаса і эксперым. базы «Дашкаў-

ка». За 22 км на Пд ад Магілёва. 1850 ж., 704 двары (1997).

Паводле пісьмовых крыніц вядома з 1597 як сяло, заснаванае кн. Б.Саламярэцкім, старостам крычаўскім і слуцкім. У 1604 у Вейнянскім войтаўстве Магілёўскага староства. У 1758 мястэчка ў т.зв. Быхаўскім графстве, прыватнае ўладанне, 50 двароў. У 1885 адкрыта школа. У 1897 — 1197 ж., 195 двароў, нар. вучылішча, царква, пераходная прыстань, магазін, млын, маслабойня, крупадзёрка, 3 заезныя дамы. З 1924 у Магілёўскім р-не. У 1971 — 1807 жыхароў.

Магілёўская абл. доследная с.-г. станцыя і праектна-пошукавая станцыя хімізацыі сельскай гаспадаркі, дрэваапрацоўчы з-д. Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — сядзібны дом (пач. 20 ст.). Каля вёскі група археал. помнікаў (стаянка каменнага веку, гарадзішчы, селішча і курганны могільнік).

ДАШКЕ́ВІЧ Вячаслаў Іосіфавіч (н. 15.4.1941, в. Дзякшняны Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1965). Працаваў у прэсе, на Бел. тэлебачанні. З 1989 у Ін-це філасофіі і права Нац. АН Беларусі. Друкуецца з 1963. У вершах Д. — жыццё і праца, трывогі і клопаты сучаснікаў. Выступае як публіцыст. На бел. мову пераклаў п'есу Э.Вільдэ «Няўлоўны цуд».

Тв.: Загадка Атлантыды. Мн., 1983.

ДАШКЕ́ВІЧ Мікалай Паўлавіч (16.8.1852, в. Бяжоў, Жытомірская вобл., Украіна — 2.2.1908), украінскі і расійскі гісторык і літаратуразнавец; прадстаўнік культ.-гіст. школы і параўнальна-гіст. метаду ў літаратуразнаўстве. Акад. Пецярб. АН (з 1907). Скончыў Кіеўскі ун-т (1873), потым прафесар у ім. Даследаваў гісторыю Паўд. Расіі і ВКЛ, у т.л. Беларусі. Удакладніў храналогію некат. падзей, асветленых у Галіцка-Валынскім летапісе, выказаў здагадку, што летапісная Літва знаходзілася ў вярхоўі Нёмана. Аўтар прац па рус. былінны эпас, творчасць рус. і ўкр. пісьменнікаў.

ДАШКО́ЛЬНАЕ ВЫХАВА́ННЕ І НАВУЧА́ННЕ, выхаванне і навучанне дзяцей у сям'і і *дашкольных установах* да паступлення ў школу. У адпаведнасці з Законам «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» (29.10.1991) вядучая роля ў гэтым належыць сям'і. У дапамогу ёй ствараюцца дашкольныя ўстановы, куды дзеці паступаюць пераважна з трох гадоў, у асобных выпадках з больш ранняга ўзросту (2 месяцы). З улікам патрэб сям'і, яе культ., нац., этнічных асаблівасцей створаны дашкольныя ўстановы розных відаў (дзярж., прыватныя, мяшаныя, калектыўныя) і тыпаў (яслі, дзіцячыя сады, яслі-сады, школы — дзіцячыя сады, цэнтры развіцця дзяцей). Паводле прызначэння яны падзяляюцца на дашкольныя ўстановы агульнага развіцця дзіцяці, з паглыбленымі кірункамі ў рабоце (эстэт., фіз. выхавання і інш.), па доглядзе, назіранні і аздараўленні, кампенсоўныя (для дзяцей, якія маюць патрэбу ў карэкцыі фіз. і псіхічнага развіцця), камбінаваныя. Выхаваўча-навуч. работа праводзіцца па праграме дашкольнага выхавання з улікам фіз. і псіхічных асаблівасцей дзяцей. Асн. ўвага аддаецца ахове і ўмацаванню здароўя дзяцей, абароне іх ад неспрыяльнага экалагічнага ўплыву, фарміраванню належных маральных рыс, нац. самасвядомасці, выяўленню задаткаў і здольнасцей дзяцей і стварэнню ўмоў для іх мэтанакіраванага развіцця. Кадры для дашкольных устаноў рыхтуюць *Беларускі педагагічны універсітэт, Брэсцкі універсітэт, Віцебскі універсітэт*, пед. ін-ты ў Магілёве, Мазыры, каледжы ў Барысаве, Гомелі, Магілёве, Полацку, Салігорску, пед. вучылішчы ў Гродне, Лідзе, Мінску, Пінску, Рагачове. *С.І.Палякевіч, А.В.Маслава.*

ДАШКО́ЛЬНАЯ ПЕДАГО́ГІКА, галіна педагогікі, якая вывучае заканамернасці развіцця, выхавання і элементарных формаў навучання дзяцей дашкольнага ўзросту. Цесна звязана з практыкай выхавання дзяцей, а таксама з гісторыяй педагогікі, агульнай педагогікай, *дзіцячай псіхалогіяй*, узроставай анатоміяй і фізіялогіяй, *педыятрыяй*, эстэтыкай, этыкай, методыкамі дашкольнага выхавання. Асноўныя задачы Д.п.: улік асаблівасцей псіхічнага развіцця дзіцяці ў працэсе выхавання і навучання, распрацоўка зместу, формаў і метадаў работы з дзецьмі ранняга і дашкольнага ўзросту, адукацыі дашкольнікаў, распрацоўка зместу фіз., інтэлектуальна-пазнаваўчага, маральнага, працоўнага, эстэт. выхавання, пошук аптымальных метадаў арг-цыі работы дашкольных устаноў, формаў работы з бацькамі, вывучэнне і кіраванне рознабаковай дзейнасцю дашкольнікаў. *К.А.Архіпава.*

ДАШКО́ЛЬНЫЯ ЎСТАНО́ВЫ. Прызначаны для выхавання дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. На 1.1.1997 у Рэспубліцы Беларусь 4511 Д.у. (444,3 тыс. дзяцей), у т.л. 3875 устаноў агульнага тыпу (яслі, дзіцячыя сады, яслі-сад), 27 санаторных, 28 кампенсуючых для дзяцей з адхіленнямі ў псіхафіз. развіцці, 13 з паглыбленымі кірункамі ў рабоце, 3 цэнтры развіцця дзіцяці; 54,1 тыс. пед. работнікаў, у т.л. 42,1 тыс. выхавацеляў, каля 5 тыс. муз. кіраўнікоў, 974 лагапеды, 993 кіраўнікі фіз. культуры, 87 настаўнікаў замежнай мовы (гл. таксама *Дашкольнае выхаванне і навучанне*). *А.В.Маслава.*

ДАШКО́Ў Яўген Іванавіч (н. 15.2.1941, г. Екацярынбург, Расія), рускі і бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1976). У 1961—67 працаваў у т-рах Казані, Свярдлоўска, Бранска. З 1967 у Гомельскім абл. драм. т-ры. Выканаўца роляў гераіка-рамантычных, характарных і лірычных. Творчая манера адметная спалучэннем мяккага лірызму з адчуваннем драматызму чалавечага лёсу. Сярод лепшых роляў: Башлыкоў («Подых навальніцы» паводле І.Мележа), князь Уладзімір («Гора і слава» А.Петрашкевіча), Васіль («Таблетку пад язык» А.Макаёнка), Павел, Сяргей («Грэшнае каханне», «Амазонкі» А.Дзялендзіка), Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), Дон Хуан («Каханне не жарты» П.Кальдэрона), Фіеска («Змова Фіеска ў Генуі» Ф.Шылера), Бусыгін («Спатканне ў прадмесці» А.Вампілава).

ДАШНАКІ́, члены армянскай нацыянальнай партыі «Дашнакцуцюн» («Саюз»), засн. ў 1890 у Тбілісі. Імкнуліся да вызвалення армян з-пад тур. прыгнёту і аўтаноміі арм. дзяржавы. Падтрымалі лют. рэвалюцыю 1917 у Расіі, але выступілі супраць бальшавікоў і Кастр. рэвалюцыі 1917; адарвалі Арменію ад Расіі і разам з эсэрамі, меншавікамі і мусаватыстамі стварылі *Закаўказскі камісарыят*, потым *Закаўказскі сейм*. У маі 1918 — ліст. 1920 «Дашнакцуцюн» — правячая партыя ў арм. рэспубліцы. Пасля ўступлення сюды Чырв. Арміі ўрад Д. (знаходзіўся ў г. Александропаль) заключыў дагавор з Турцыяй аб стварэнні ў яе межах аўтаномнай арм. дзяржавы. У лют. 1921 Д. арганізавалі ў Арменіі антысав. паўстанне, пасля разгрому якога партыя «Дашнакцуцюн» ліквідавана. У эміграцыі арг-цыі Д. дзейнічаюць у ЗША, Францыі, Грэцыі, Іране і інш. У пач. 1990-х г. аднавілі легальную дзейнасць у Арменіі.

Н.К.Мазоўка.

ДА́ШТЫ-МАРГО́, пустыня на ПдЗ Афганістана, паміж далінамі рэк Гільменд і Хашруд. Пл. каля 150 тыс. км^2. Выш. 500—700 м. Друзаватыя і гліністыя раўніны з рэдкай палына-салянкавай расліннасцю; на ПдЗ — масівы пяскоў, такыры, саланчакі, па ўскраінах — аазісы. Адгонная жывёлагадоўля. Вярблюдагадоўля.

В.Н.Дашук.

ДАШУ́К Віктар Нічыпаравіч (н. 16.9.1938, в. Валокі Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. кінарэжысёр і сцэнарыст. Засл. дз. маст. Беларусі (1978). Скончыў БДУ (1960), Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве (1967). З 1960 на кінастудыі «Беларусьфільм», працуе ў галіне дакумент. кіно. Для творчасці Д. характэрны арганічны сплаў лірыкі і публіцыс-

тыкі. Стварыў цыклы публіцыстычных фільмаў (Дзярж. прэмія СССР 1985): «Хатынскі цыкл» (1975—78, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1976); «У вайны не жаночы твар» (1980—84, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Лейпцыгу 1983). З інш. фільмаў: «Дом» (1970), «А зязюля кукавала...» (1972, біяграфічны пра Я.Купалу), «Развітанне» (1980), «Вiцебская справа» (1991).

ДАШЧА́НКА, 1) нізенькая *кадушка* з тонкіх клёпак для мукі, збожжа, служыла і за сявеньку. 2) Лодка з дошак.

ДАШЧЫ́НСКІ Юзаф (1781, Вільня — 1844), бел. піяніст, кампазітар, дырыжор, педагог. З 1813 выкладаў музыку ў Віленскім ун-це, у 1814 па запрашэнні меламана і мецэната, скрыпача-аматара Л.М.Ракіцкага пераехаў на жыхарства ў яго маёнтак Гарадзішча пад Мінскам, дзе да 1844 узначальваў сімф. аркестр. Пад яго кіраўніцтвам у Гарадзішчы і ў Мінску прагучалі оперы «Аксур, цар Армуза» А.Сальеры і «Белая дама» Ф.А.Буальдзьё, сімфоніі І.Гайдна, В.А.Моцарта, Л.Бетховена. Аўтар каля 100 муз. твораў, выдадзеных у Маскве, Вільні, Варшаве, Вене, Лейпцыгу. Найб. папулярныя былі 3 фп. канцэрты, фп. квартэт a-moll, стр. секстэт, меладрама «Этберт», музыка да камедыі Л.Дмушэўскага «Сядзіба пры дарозе», паланэзы (лепшыя, на погляд сучаснікаў, не саступалі паланэзам М.К.Агінскага і К.Курпінскага).

Літ.: Jelski M. Kilka wspomnień z przeszłości muzycznej Litwy // Echo muzyczne. 1881. № 23. *А.Л.Капілаў.*

ДАШЫ́ЕЎ Дугаржап Цырэнавіч (н. 15.5.1939, с. Улзар, Бурацыя, Рас. Федэрацыя), бурацкі спявак (лірыка-драм. тэнар). Нар. арт. Расіі (1979). Нар. арт. СССР (1986). Скончыў Уральскую кансерваторыю (1969). З 1969 саліст Бурацкага т-ра оперы і балета. Сярод партый: Герман («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Андрэй Хаванскі («Хаваншчына» М.Мусаргскага), Атэла, Дон Карлас, Альфрэд, Радамэс («Атэла», «Дон Карлас», «Травіята», «Аіда» Дж.Вердзі), Хазэ («Кармэн» Ж.Бізэ), Каніо («Паяцы» Р.Леанкавала), Баір («Цудоўны скарб» Б.Ямпілава), Энхэ («Энхэ—Булат-батар» М.Фралова). Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя Глінкі (Масква, 1968). Дзярж. прэмія Бурацыі 1977. Дзярж. прэмія Расіі 1983.

ДАЯХАТЫ́Н, помнік архітэктуры 12 ст. ў Туркменістане; *караван-сарай*. За 170 км на ПнУ ад г. Чарджоў, на шляху г. Мерв—Харэзм. Квадратны ў плане аб'ём з унутр. 4-тэрасным дваром і галерэяй па перыметры перакрыты разнастайнымі варыянтамі скляпенняў у інтэр'ерах. Сцены змураваны з сырцу і аблiцаваны абпаленай цэглай. Гал. і дваровы фасады ўпрыгожаны геам. і эпіграфічным арнаментам.

«ДВА АГНІ», бел. нар. гульня. Удзельнікі (8—20 чал.) дзеляцца на 2 каманды, выбіраюць «агнёў» (вядучых). На пляцоўцы чэрцяць «калідор» (даўж. 8—12 м, шыр. 8—10 м). «Агні» становяцца ў «калідоры», гульцы — паабапал яго. Ударам аб зямлю ўнутры «калідора» гулец адной каманды перакідвае мяч гульцу другой, а «агні» ловяць. Гулец, мяч якога злоўлены, лічыцца «згарэлым» і выбывае. Гульня працягваецца, пакуль «агні» выведуць з яе гульцоў другой каманды. Гульню можна праводзіць і са зменай «агнёў» праз 10—15 мін. Перамагае той, хто выведзе з гульні найб. гульцоў. *Я.Р.Вількін.*

ДВА ГРО́ШЫ (польск. dwugrosz), сярэбраная манета Рэчы Паспалітай і некат. краін Зах. Еўропы. 1) У 1565 выраблена ў ВКЛ *Віленскім манетным дваром* як пераходны намінал паміж манетамі, бітымі па кароннай і літоўскай стапе; роўны 5 паўгрошам каронным ці 4 літоўскім. 2) У 17 ст. агульнадзярж. (1650—51, 1672) і гарадская (1651—53) манета Рэчы Паспалітай, выпушчаная для зручнасці пераходу ад *орта* да драб-

а *б* *в*

Да арт. **Двайнікаванне**. Двайнікі росту: *а* — пірыт; *б* — кальцыт; *в* — полісінтэтычны двайнік альбіту.

нейшых наміналаў. 3) У 18 ст. манета (1766—82, 1785—86), адпаведная палове асн. адзінкі грашова-лікавай сістэмы ў Рэчы Паспалітай — паўзлотага ў 4 сярэбраныя грошы, эквівалентныя 15 медным грошам. *І.І.Сінчук.*

«25 САКАВІКА», часопіс студэнцкай моладзі Віленскага ун-та. Выдаваўся ў 1936—39 у Вільні на бел. мове. Прытрымліваўся ідэйна-паліт. праграмы групоўкі моладзі, якая імкнулася спалучаць ідэал суверэннай Беларусі з хрысціянствам і элементамі сацыялізму. У «Ідэйнай дэкларацыі маладых адраджэнцаў» выказваўся за кааператыўна-карпарацыйны лад як аснову дзярж. ладу. Сваю мэту бачыў у садзейнічанні фарміраванню «новага тыпу беларуса...» на аснове абвешчанай у 1918 незалежнасці БНР. Прапагандаваў ідэю суверэннасці Беларусі, аддаваў увагу праблемам духоўнага жыцця народа і ролі нар. культуры, асвятляў дыскусійныя пытанні, падзеі ў культ. і грамадскім жыцці Зах. Беларусі і ў Вільні. Выйшла 5 нумароў. *А.С.Ліс.*

ДВАЙКО́ВАЯ АДЗІ́НКА, тое, што *біт*.

ДВАЙКО́ВАЯ СІСТЭ́МА ЛІЧЭ́ННЯ, пазіцыйная сістэма лічэння з асновай 2. Мае толькі 2 знакі — лічбы 0 і 1. Лік 2 лічыцца адзінкай 2-га разраду і запісваецца ў выглядзе 10 (чытаецца: «адзін—нуль»), лік 4 — 3-га разраду і запісваецца як 100 і г.д. Кожная адзінка наступнага разраду ўдвая большая за папярэднюю. Каб лік, запісаны ў дзесятковай сістэме лічэння, запісаць у Д.с.л., яго выражаюць праз ступені ліку 2, напр., $45_{10} = 1{\cdot}2^5 + 0{\cdot}2^4 + 1{\cdot}2^3 + 1{\cdot}2^2 + 0{\cdot}2^1 + 1{\cdot}2^0 = 101101_2$. Выкарыстоўваецца ў тэарэт. пытаннях і для апрацоўкі інфармацыі на лічбавых ЭВМ (уваходныя і выхадныя даныя прадстаўляюць у дзесятковай сістэме лічэння).

У Д.с.л. найб. проста выконваюцца ўсе арыфм. дзеянні, напр., табліца множання зводзіцца да роўнасці 1·1 = 1. Аднак гэта сістэма нязручная з-за грувасткага запісу лікаў, напр., лік 9000 у Д.с.л. будзе 14-разрадным. Каб скараціць даўжыню запісаў праграм для ЭВМ, кожныя 3 ці 4 двайковыя лічбы замяняюць адным сімвалам (з алфавіта 0, 1, ..., 7 або 0, 1, ..., 9, A, B, C, D, E, F адпаведна) і атрымліваюць запіс у васьмярковай ці шаснаццатковай сістэме лічэння. Гл. таксама *Лічэнне*. *М.П.Савік.*

ДВАЙНІКАВА́ННЕ, утварэнне ў *монакрышталі* абласцей з заканамерна зменена арыентацыяй крышт. структуры. Структуры двайніковых утварэнняў з'яўляюцца люстраным адбіткам атамнай структуры зыходнага крышталя (матрыцы) у пэўнай плоскасці (плоскасці Д.) ці ўтвараюцца паваротам структуры матрыцы вакол крышталеграфічнай восі (восі Д.) на пастаянны для дадзенага рэчыва вугал або іншым пераўтварэннем *сіметрыі крышталёў*. Матрыца з двайніковым утварэннем наз. д в а й н і к о м .

У залежнасці ад колькасці зрошчаных двайніковых утварэнняў структуры наз. трайнікамі, чацвернікамі ці наогул полісінт. двайнікамі. Д. можа адбывацца пры крышталізацыі, мех. дэфармацыі, зрастанні суседніх зародкаў (двайнікі росту), хуткім цеплавым расшырэнні ці сцісканні, награванні дэфармаваных крышталёў (двайнікі рэкрышталізацыі), пры пераходзе ад адной крышт. мадыфікацыі да другой. Напр., у крышталях сегнетавай солі двайнікі ўтвараюцца пры пераходзе крышталя ад рамбічнай структуры да моноклінной (пры т-ры Кюры). Д. ўплывае на мех. (трываласць, пластычнасць, крохкасць), эл., магн., аптычныя ўласцівасці крышталёў, пагаршае якасць паўправадніковых прылад. Заканамернасці Д. выкарыстоўваюцца для дыягностыкі мінералаў, устанаўлення пахо-



а *б* *в*

Двайнікі: *а* — двайнік гіпсу («ластаўчын хвост»); *б* — полісінтэтычны двайнік плагіяклазу; *в* — каленчаты трайнік рутылу.

джання і ацэнкі некат. мінералаў як прамысл. сыравіны.

Літ.: Современная кристаллография. Т. 2. М., 1979; Т. 4. М., 1981. *Р.М.Шахлевіч.*

ДВАЙНІКІ́ ў г е а л о г і і, заканамерныя зросткі двух (Д. простыя, адзінарныя) ці некалькіх (Д. полісінт. шматразовыя) крышталёў з падобнымі крышт. рашоткамі, якія арыентаваны паралельна двум геаметрычным элементам. Паводле генезісу адрозніваюць Д. першасныя (росту, рэкрышталізацыйныя і камбінаваныя) і Д. другасныя (інверсійныя, дэфармацыйныя, інтэрферэнцыйныя). Паводле спосабу фарміравання вылучаюць Д. кантактавыя, поўныя, няпоўныя, замкнёныя.

ДВАЙНО́ГА АДМАЎЛЕ́ННЯ ЗАКО́Н, закон логікі, паводле якога адмаўленне адмаўлення (г.зн. паўторанае двойчы адмаўленне) дае сцвярджэнне. Напр.: «Калі няправільна, што сусвет не з'яўляецца бясконцым, то ён бясконцы». Гэты закон вядомы з часоў антычнасці. Стараж.-грэч. філосафы Зянон Элейскі і Горгій выкладалі яго так: калі з адмаўлення якога-н. выказвання выходзіць супярэчнасць, то мае месца двайное адмаўленне зыходнага выказвання, г.зн. яно само. Д.а.з. запісваецца ў вылічэнні выказванняў сучаснай матэм. логікі наступным чынам: a→A, што чытаецца так: «двайное адмаўленне а мае вынікам А'» (знак → — знак *імплікацыі*, які адпавядае злучніку «калі, то»). Другі закон логікі, які гаворыць аб магчымасці не здымаць, а ўводзіць 2 адмаўленні, называюць з в а р о т н ы м Д.а.з.: двайное сцвярджэнне мае вынікам сваё двайное адмаўленне. Напр.: «Калі Шэкспір пісаў санеты, то няпраўда, што ён не пісаў санеты». Аб'яднанне гэтых 2 законаў дае п о ў н ы Д.а.з.: двайное адмаўленне раўназначна сцвярджэнню. Напр.: «Планеты не нерухомыя толькі ў тым выпадку, калі яны рухаюцца».

ДВАЙНО́Е АПЛАДНЕ́ННЕ, тып палавога працэсу, уласцівы *пакрытанасенным* раслінам. Адкрыў у 1898 рус. батанік С.Г.*Навашын*. Заключаецца ў тым, што пры фарміраванні семя гаплоідная яйцаклетка апладняецца адным (генератыўнае апладненне), а дыплоіднае ядро цэнтр. клеткі зародкавага мяшка — другім (вегетатыўнае апладненне) *спермія*м пылковага зерня. У выніку генератыўнага апладнення ўтвараецца дыплоідная *зігота*, якая дае пачатак *зародку*. Вынікам вегетатыўнага апладнення служыць узнікненне пач. клеткі трыплоіднага *эндасперму* (пажыўнай тканкі семені). Д.а. забяспечыла пакрытанасенным раслінам пашырэнне на Зямлі і амаль неабмежаваныя магчымасці прыстасавання да ўмоў існавання (ад тропікаў да тундраў, ад вільготных мясцін да пустынь).

ДВАЙНО́Е ГРАМАДЗЯ́НСТВА, гл. ў арт. *Біпатрыды*.

ДВАЙНО́Е ПАДАТКААБКЛАДА́ННЕ, 1) абкладанне і даходу (прыбытку), і *дывідэндаў*, якія выплачваюцца з яго, калі яны ператвараюцца ў асабісты даход сям'і як самаст. гасп. адзінкі (домагаспадаркі). 2) Адначасовае абкладанне ў розных краінах ідэнтычнымі падаткамі, або тымі, якія маюць аднолькавую прыроду.

ДВАНАДЗЕСЯ́ТЫЯ СВЯ́ТЫ, 12 найбольш значных свят праваслаўя: Раство Хрыстова (*Каляды*) — 7 студз. (25 снеж. па с.ст.), Хрышчэнне Гасподняе (*Вадохрышча*) — 19(6) студз.; Стрэчанне Гасподняе (*Грамніцы*) — 15 (2) лют., *Дабравешчанне* — 7 крас. (25 сак.), Уваход Гасподні ў Іерусалім (*Вербніца*) — за тыдзень да Вялікадня, Узнясенне Гасподняе (*Ушэсце*) — на 40-ы дзень пасля Вялікадня, Дзень св. Тройцы (*Сёмуха*, Пяцідзесятніца) — на 50-ы дзень пасля Вялікадня, Праабражэнне Гасподняе (*Спас*) — 19 (6 жн.), Успенне Прасвятой Багародзіцы (*Прачыстая*) — 28 (15) жн., Раство Прасвятой Багародзіцы 21 (8 вер.), Узвіжанне Крыжа Гасподняга — 27 (14) вер., Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы (Уводзіны) — 4 снеж. (21 ліст). Разам з *Вялікаднем* лічацца галоўнымі святамі правасл. царквы. Пераважная большасць хрысц. свят прымеркавана да стараж. свят, звычаяў і абрадаў нар. календара. Звычайна хрысц. святы пачынаюцца з вечара, з усяночнай, а раніцай у царкве адбываецца святочная літургія.

А.У.Верашчагіна.

ДВАНА́ЦЦАТАЯ КАНФЕР'Э́НЦЫЯ КП(б)Б, гл. *Сёмы з'езд КП(б)Б*.

ДВАНА́ЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся ў Мінску 5—16.2.1929. Прысутнічала 356 дэлегатаў з рашаючым і 222 з дарадчым голасам ад 41 207 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздача ЦК КП(б)Б (Я.Б.Гамарнік); даклад Рэвіз. камісіі КП(б)Б (Я.М.Кроль); справаздача ЦКК КП(б)Б (А.Я.Калнін); даклад аб пяцігадовым плане развіцця нар. гаспадаркі і культуры БССР 1928/29—1932/33 (М.М.Галадзед); аб вярбоўцы рабочых у партыю і чыстцы КП(б)Б (І.А.Васілевіч); аб рабоце прафсаюзаў (І.П.Рыжоў); выбары кіруючых органаў КП(б)Б.

Гал. ідэя, што вызначыла ход з'езда і яго пастановы, — ідэя абвастрэння класавай барацьбы. Ставіліся задачы ўсямернага і няўхільнага павышэння ўдзельнай вагі прам-сці, асабліва буйной, калектывізацыі сельскай гаспадаркі з прыярытэтам калгаснай і саўгаснай формаў. Гал. разлік рабіўся на адм. прымусовыя меры ў спалучэнні з маральнымі стымуламі, на энтузіязм, сацыяліст. спаборніцтвы і паліт. выхаванне. Курс на адзяржаўленне вытв-сці і размеркавання, выцяснення прыватнага капіталу з вытв-сці, фінансаў, гандлю, які выразна выявіўся ў 1926—27, набыў у рашэннях з'езда завершанае афармленне. Указвалася на неабходнасць павышэння тэмпаў ліквідацыі непісьменнасці, пашырэння сеткі школ, падрыхтоўкі маладых навук. сіл, якія выйшлі з пралет. асяроддзя. З'езд патрабаваў узмацніць барацьбу з праявамі шавінізму, нацыянал-дэмакратызму, нацыянал-ухілізму ў розных формах, што прыкрывала змену курсу ўсёй нац. палітыкі. Для БССР гэта азначала адмаўленне ад палітыкі *беларусізацыі*, якая праводзілася ў 1920-я гады. З'езд выбраў ЦК КП(б)Б з 77 чл. і 57 канд., ЦКК з 76 чал., Цэнтр. рэвіз. камісію з 7 чал.

Літ.: Стэнаграфічная справаздача XII з'езда КП(б)Б (5—14 лют. 1929 г.). Мн., 1929; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 2. 1928—1932. Мн., 1984. *А.С.Кароль.*

ДВАНА́ЦЦАТЫ УСЕБЕЛАРУ́СКІ З'ЕЗД САВЕ́ТАЎ (н а д з в ы ч а й н ы). Адбыўся ў Мінску 20—23.11.1936 і 15—19.2.1937. Прысутнічалі 843 дэлегаты, пераважную большасць якіх складалі камуністы і камсамольцы. Парадак дня: аб праекце Канстытуцыі СССР (А.Р.Чарвякоў); выбары дэлегатаў на VIII Усесаюзны Надзвычайны з'езд Саветаў; праект Канстытуцыі БССР (М.М.Галадзед). На пасяджэннях у ліст. 1936 з'езд абмеркаваў і аднагалосна адобрыў праект Канстытуцыі СССР, абраў на VIII Усесаюзны з'езд Саветаў 63 дэлегаты і ў сувязі з пачаткам яго работы (25 ліст.) спыніў сваю працу. У лют. 1937 з'езд разгледзеў і прыняў за аснову праект Канстытуцыі БССР, утварыў рэдакцыйную камісію для разгляду папраўак і дадаткаў. У апошні дзень працы зацвердзіў *Канстытуцыю Беларускай ССР 1937*. ЦВК рэспублікі было даручана распрацаваць і зацвердзіць палажэнне аб выбарах і прызначыць дату выбараў у Вярх. Савет БССР. Работу з'езда характарызавалі здравіцы І.В.Сталіну і інш. кіраўнікам саюзнага і рэсп. маштабу. У абставінах культу асобы работа з'езда праходзіла па строгім рэгламенце, пад кантролем парт. і адм. структур.

Літ.: Бюлетэнь Надзвычайнага XII з'езда Саветаў БССР. [Мн., 1936]. № 1—6.

М.П.Касцюк.

ДВАНАЦЦАЦІПЕ́РСНАЯ КІ́ШКА, пачатковы аддзел тонкай кішкі ад выхаднога адтуліны страўніка да парожняй кішкі. Даўжыня яе ў чалавека 27—30 см (прыблізна 12 папярочнікаў пальца, адсюль назва). У поласці Д.к. адкрываюцца вывадныя пратокі падстраўнікавай залозы і печані. Залозістыя элементы сценкі выдзяляюць сакрэт, у якім ёсць ферменты, неабходныя для ператраўлення бялкоў, тлушчаў і вугляводаў (у поласці Д.к. ператраўленне рэчываў найб. інтэнсіўнае).

ДВАНАЦЦАЦІТО́НАВАСЦЬ, д а д э к а т о н і к а, д в а н а ц ц а ц і т о н а в а я г а р м о н і я, від дванаццаціступеннай гукавой сістэмы, у якой кожны гук можа функцыянаваць як самаст. элемент. З ёю звязаны многія новыя віды тэхнікі ў музыцы 20 ст., у т.л. сіметрычныя лады (І.Стравінскі, А.Месіян), «сінтэтакорды» М.Рослаўца, *дадэкафонія*, тропы (І.М.Хаўэр), 12-тонавыя рады (Дз.Шастаковіч, Р.Шчадрын), 12-тонавыя палі, акорды, свабодная *атанальнасць* і інш.

ДВАРАКО́ЎСКІ Валяр'ян Дзмітрыевіч (10.9.1904, Мінск — 18.8.1979), бел.

графік. Скончыў Вышэйшы маст.-тэхн. ін-т у Ленінградзе (1929). Працаваў у станковай і кніжнай графіцы, плакаце. У 1929—31 маст. рэдактар Белдзяржвыда. З 1931 у Ленінградзе. Афарміў кнігі «Сымон-музыка» Я.Коласа і «Два» А.Вольнага (1925), «Выбраныя апавяданні» (1926) і «У глыбі Палесся» (1927) Я.Коласа, «У віры жыцця» М.Зарэцкага, зборы твораў Я.Купалы (т. 2, 2-е выд.) і Ц.Гартнага (т. 2; усе 1929), «Яўтен Анегін» А.Пушкіна (1937), «Выбранае» Ю.Тынянава (1941), «Байкі» І.Крылова (1944), «Лірыка» А.Пракоф'ева (1956), зб. «Нашы казкі» (1965) і інш. Творы Д. вызначаюцца высокай тэхнікай выканання, арыгінальнасцю кампазіцыйнай будовы. *Л.Дз.Налівайка.*

ДВАРАНІ́Н, 1) у ВКЛ і Рэчы Паспалітай шляхціц, які служыў пры двары вял. князя ці караля (Д. гаспадарскі, Д. яго каралеўскай мосці). Зрэдку такая пасада існавала і пры дварах магнатаў. Вядомы з 15 ст. Звычайныя функцыі — выкананне розных спец. даручэнняў вял. князя, перш за ўсё судовых. 2) У Расійскай дзяржаве (з канца 18 ст. і ў Беларусі) прадстаўнік *дваранства*.

ДВАРАНІ́Н Арсень Міхайлавіч (н. 13.3.1949, в. Малыя Краглі Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. мастак лэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1977). Працуе ў тэхніцы габелену. Асн. работы (усе з жонкай І.*Данілавай*): трыптых «Раніца», «Поўдзень», «Вечар» (1986—87), дыптых «Мой горад», «Маё Палессе» (1988—90) для аэрапорта, «Музыка» (1990—91), «Песня» (1991—93), «Музыка і тэатр» (1994) для муз. і маст. навуч. устаноў, «Песня пра зубра» (1995), для абл. драм. т-ра — усе ў Гомелі, «Лес» (1996) і інш. Творчасць адметная тонкім колераспалучэннем, кампазіцыйнай завершанасцю, эмацыянальнасцю.

Т.Ф.Літвінава.

ДВАРА́НСКІ ЗЯМЕ́ЛЬНЫ БАНК, Дзяржаўны дваранскі зямельны банк, саслоўная крэдытная ўстанова для дваран у Рас. імперыі ў 1885—1917. Засн. царскім урадам для крэдытавання памешчыкаў пад заклад зямлі і будынкаў. Меў аддзяленні ва ўсіх, у т.л. бел., губернях. Пазыкі даваліся на самых ільготных умовах: да 1900 крэдыт даваўся на тэрмін да 48 гадоў 8 месяцаў, пры 5,75% гадавых. Пасля 1900 тэрмін пазыкі падоўжаны да 66,5 года, а плата за крэдыт зніжана да 3;5—4%, даваліся і інш. льготы. У Беларусі банк не абслугоўваў дваран «польскага паходжання» і каталіцкага веравызнання, якія былі вымушаны звяртацца да камерц. акц. банкаў на менш выгадных умовах. Да 1900 большая частка дваранскіх маёнткаў у Беларусі была закладзена ў банках, у 1917 звыш чвэрці іх — у Дз.б. Дзейнасць банка фактычна спынілася ў пач. 1917, афіцыйна скасаваны 21.12.1917. *З.І.Гяргідзе.*

ДВАРА́НСКІ ІНСТЫТУ́Т, закрытая мужчынская сярэдняя навуч. ўстанова для дваранскіх дзяцей у Рас. імперыі ў 19 ст. Паводле рэформы 1828 ствараліся як дзярж. навуч. ўстановы на базе гімназій і высакародных пансіёнаў. Рыхтавалі да стацкай і дыпламат. службы, паступлення ва ун-т. Навучанне платнае. Існавала 5 Д. і.: у Маскве (1833—49), Вільні (1838—63), Пензе (1843—63), Ніжнім Ноўгарадзе (1844—1917) і Высакародны ін-т у Варшаве (1844—63). Не набылі пашырэння з-за таго, што дваране традыц. імкнуліся ўладкаваць сваіх дзяцей у ваен. навуч. ўстановы.

ДВАРА́НСКІ СХОД, карпаратыўны орган дваранскага самакіравання ў губернях і паветах Рас. імперыі ў канцы 18 — пач. 20 ст. Узніклі ў паветах у 1766, потым утвораны губернскія дваранскія т-вы і іх органы — губернскія Д.с. У 1775 «Устанаўленне для кіравання губернямі», а ў 1785 «Даравальная грамата дваранству» узаконілі арганізац.

А.**Дваранін**. Лес. 1995.

структуру губернскіх і павятовых Д.с. Звычайна яны збіраліся раз у 3 гады; надзвычайныя маглі склікацца часцей, але з дазволу губернатара. Губернскія Д.с. абмяркоўвалі ўсе саслоўныя справы і пытанні, прапанаваныя дзярж. ўладамі; мелі права рабіць прадстаўленні губернатару, міністру ўнутр. спраў, а ў асабліва важных выпадках непасрэдна цару. Важнейшай функцыяй Д.с. былі выбары саслоўных дваранскіх органаў. Павятовыя Д.с. збіраліся за 3 месяцы да губернскага сходу і разглядалі саслоўныя справы павятовага маштабу. Д.с. скасаваны ў 1917.

ДВАРА́НСТВА, саслоўе свецкіх землеўладальнікаў, якое валодала спадчыннымі прывілеямі; адзін з пануючых класаў у феад. грамадстве. Першапачаткова значэнне рус. тэрміна «Д.» і зах.-еўрап. тэрмінаў, якія перакладаюцца як Д., не зусім ідэнтычнае: на Русі — гэта пры сваім узнікненні ваенна-служылы слой, які процістаўляецца баярству, у Зах. Еўропе тэрміны (noblesse у Францыі, nobility у Англіі, Adel у Германіі) першапачаткова азначалі арыстакратыю, знаць (ад лац. nobilis знатны). З умацаваннем цэнтралізаванай дзяржавы і аб'яднаннем усіх свецкіх феадалаў у адзінае саслоўе гэтыя тэрміналагічныя адрозненні знікалі. Д. належала прамое паліт. панаванне ў феад. грамадстве. Асновай яго паліт. і эканам. магутнасці была ўласнасць на зямлю. Сярод інш. саслоўяў Д. вылучалася становішчам, прывілеямі, выхаваннем, побытам, асобым кодэксам дваранскай маралі.

У Заходняй Еўропе Д. фарміравалася па меры станаўлення феад. саслоўяў, але канчаткова як адзінае саслоўе свецкіх феадалаў складвалася разам з ліквідацыяй феад. раздробленасці ў саслоўных і абсалютных манархіях. У асяроддзі Д. існавала пэўная іерархія, падзел на вышэйшае і ніжэйшае Д. (не заўсёды замацаваны юрыдычна): бароны і рыцары ў Англіі, гранды і ідальга ў Іспаніі, магнаты і шляхта ў Польшчы і ВКЛ і г.д. Да вышэйшага Д. прылічвалі найб. стараж. арыстакратычныя роды. Дваранскую іерархію ў некат. ступені адлюстроўвалі шматлікія тытулы — герцаг, маркіз, граф, барон, віконт і інш. Становішча Д., ступень яго адасобленасці ад інш. саслоўяў, паўната яго прывілеяў у розных краінах былі розныя. У Францыі Д. было вызвалена ад падаткаў, жыло за кошт рэнты, служыла ў арміі або пры двары, у дзярж. апараце. Лічылася, што праца, прадпрымальніцтва, гандаль прыніжаюць дваранскую годнасць. Вышэйшае Д. звычайна з'яўлялася носьбітам сепаратысцкіх памкненняў на карысць феад. раздробленасці, ніжэйшае служыла апорай каралеўскай улады ў палітыцы цэнтралізацыі. У некат. краінах спецыфічныя ўмовы развіцця прывялі да непасрэднага паліт. панавання Д. — пры аслабленні каралеўскай улады («шляхецкая рэспубліка» ў Рэчы Паспалітай 16—18 ст.). Са стварэннем феад.-абсалютысцкай дзяржавы Д. гуртуецца вакол каралеўскай улады. Ва ўмовах абсалютызму крыніцай існавання Д. акрамя феад. рэнты становіцца яшчэ т.зв. цэнтралізаваная рэнта, якая раздавалася каралеўскай уладай у выглядзе жалавання, пенсій, субсідый. У ходзе развіцця капіталіст. адносін адна частка Д. здолела да іх прыстасавацца, стала на шлях бурж. прадпрымальніцтва, другая па-ранейшаму трымалася за чыста феад. формы гаспадарання і паступова разаралася. Знішчэнне Д. як прывілеяванага саслоўя і яго паліт. панавання было адной з задач бурж. рэвалюцый. Аднак Д. звычайна ўдавалася зберагчы некат. прывілеі. Гэтаму садзейнічала і зліццё ў

перыяд капіталізму часткі Д. з буржуазіяй. Асабліва доўга, калі не юрыдычна, то фактычна, захоўваліся такія прывілеі Д., як каставасць каманднага складу арміі, вярхоў дзярж. апарата, дыпламат. корпуса, дваранскія тытулы і інш.

У краінах Усходу Д. найб. выразна акрэслілася ў Японіі ў выглядзе ваенна-феад. саслоўя (бусі), якое ўключала буйных князёў (дайме) і шматлікі слой дробнага ваеннага Д. — самураяў. У Кітаі феад. іерархія ўключала 6 тытулаў: ван, гун, хоу, бо, цзы, нань. У краінах мусульм. Усходу пры юрыд. роўнасці ўсіх мусульман перад законам на практыцы існавала дакладнае размежаванне насельніцтва на «знаць» і «просты народ».

У Расійскай дзяржаве Д. як ніжэйшая праслойка феад. ваенна-служылага саслоўя ўзнікла ў 12—13 ст., складала двор князя або буйнога баярына. Дваранамі наз. т.зв. «вольных слуг», якія атрымлівалі зямельныя надзелы на час вайск. службы ў князёў і найб. багатых баяр. У працэсе аб'яднання рус. зямель у цэнтралізаваную дзяржаву Д. стала сац. і ваен. апорай вял. князя ў барацьбе з феад. міжусобіцамі. Судзебнік 1497 юрыдычна прызнаў Д. катэгорыяй пануючага класа феадалаў. Паводле перапісу 1678, дваране валодалі 85% прыгонных двароў. З 17 ст. радавое Д. запісвалася ў дзярж. радасловец і *Аксамітную кнігу*. Адмена месніцтва і ўказ Пятра I пра адзінаспадчыннасць (1714) ліквідавалі розніцу паміж Д. і баярамі і злілі іх у адзін клас Д. У 18 ст. правы і прывілеі Д. пашыраны: у 1722 яно атрымала прывілеі на дзярж. і вайск. службу, у 1762 манаполію на землеўладанне і вызвалена ад абавязковай дзярж. службы, у 1785 неабмежаваныя правы над прыгоннымі сялянамі. У выніку сял. рэформы 1861 Д. страціла неабмежаваныя правы над сялянамі і частку зямель, але захавала пануючае становішча ў кіраванні дзяржавай, паліт. жыцці, вял. зямельныя ўладанні. У канцы 19 ст. ў еўрап. ч. Расіі 30 тыс. памешчыцкіх сем'яў (каля 150 тыс. чал.) мелі 70 млн. дзесяцін зямлі, а 10,5 млн. сял. гаспадарак (каля 50 млн. чал.) — 75 млн. дзесяцін.

У Беларусі ў Д. пераведзена *шляхта* ВКЛ, якая атрымала дваранскія правы пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. У 1770-я г. Кацярына II раздавала рус. дваранам надзелы з дзесяткамі тысяч дзяржаўных прыгонных. У Магілёўскай губ. Завадоўскі атрымаў 25 860 прыгонных, Пацёмкін — 14 250, Зорыч — 11 800, Румянцаў — 11 100 і г.д. З развіццём капіталіст. адносін пачаўся эканам. заняпад часткі Д. Але і пасля адмены прыгону Д. ў Беларусі захавала пануючае становішча. Дваранам належалі ўсе адм. пасады ў губернях, права кіраваць установамі па сял. і вайск. справах, прызначаць міравых суддзяў. Па ўдзельнай вазе дваранскага землеўладання Беларусь займала 2-е месца ў еўрап. ч. Расіі пасля прыбалт. губерняў. У Беларусі было 14 магнацкіх сем'яў, ва ўласнасці якіх у 1870—80-я г. знаходзілася чацвёртая частка агульнай плошчы памешчыцкай зямлі (у Патоцкіх 261 тыс. дзес., Радзівілаў 178 тыс. дзес., Пуслоўскіх 160,1 тыс. дзес., Тышкевічаў 148,6 тыс. дзес. і інш.). Найб. ўладанні былі ў кн. П.Л.Вітгенштэйна — больш за 790 тыс. дзес. Як саслоўе Д. скасавана дэкрэтам ЦВК і СНК ад 24.11.1917 «Аб знішчэнні саслоўяў і грамадзянскіх чыноў».

Літ.: Люблинская А.Д. Франция в начале XVII в. (1610—1620 гг.). Л., 1959; Яблочков М. История дворянского сословия в России. СПб., 1876; Корелин А.П. Дворянство в пореформенной России, 1861—1904 гг.: Состав, численность, корпоративная организация. М., 1979; Каханоўскі А.Г. Дваранства Беларусі ў другой палове XIX ст.: Склад і сацыяльнае аблічча // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: Новыя канцэпцыі і падыходы. Мн., 1994. Ч. 1; Запруднік Я. Дваранства і беларуская мова // Беларусіка = Albaruthenica. Мн., 1993. Кн. 2.

ДВАРЖЭ́ЦКІ Уладзіслаў Вацлававіч (26.4.1939, г. Омск, Расія — 28.5.1978), расійскі акцёр. Скончыў тэатр. студыю пры Омскім дзіцячым т-ры (1955), дзе і працаваў. З 1971 здымаўся ў кіно. Яго мастацтва вызначалася ўменнем па-філасофску асэнсоўваць характары герояў: «Бег», «Салярыс», «Вяртанне няма», «Зямля Саннікава», «Да апошняй хвіліны» і інш. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1975.

ДВАРНІЗГАЛАЎСКАЯ СЯДЗІ́БА, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры 2-й пал. 19 ст. Размешчана на паўн.-зах. ускраіне в. Двор Нізгалава Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., на беразе р. Ула. Комплекс у стылі познята класіцызму ўключае 1-павярховы мураваны сядзібны дом (пашкоджаны ў 1944, адноўлены ў 1970), флігель, кухню, вяндлярню, 2 гасп. корпусы.

Тэрыторыя сядзібнай забудовы злучаецца з паркам невял. курцінамі з елак, хвой і клёнаў. Кампазіцыя парку (пл. 4 га) — прыклад перабудовы рэгулярнага парку ў пейзажны. Сярод насаджэнняў рэдкія ў рэспубліцы экзэмпляры бярозы далекарлійскай (выш. 17 м, дыяметр ствала 58 см) і кедра еўрап. каланападобнага (выш. 12 м, дыяметр ствала 48 см).

А.А.Міцянін.

ДВАРО́ВЫЯ ЛЮ́ДЗІ, 1) у Стараж. Русі пры дварах баяр, вял. і ўдзельных князёў ваен. слугі і выканаўчая адміністрацыя (цівуны, ключнікі, дзесяцкія, акольнічыя і інш.). 2) У Расіі з канца 17 ст. да 1861 катэгорыя прыгоннага насельніцтва без зямлі, становішча якога было блізкім да рабства. Жылі ў панскіх дварах, займаліся абслугоўваннем іх сем'яў, выкарыстоўваліся на с.-г. работах, вотчынных прадпрыемствах. Шырока практыкаваліся гандаль Д.л., абмен, дарэнні, заклад. У 1857 Д.л. ў Расіі складалі 6,8% ад колькасці прыгонных, у Беларусі — 3,4%. У час падрыхтоўкі адмены прыгоннага права колькасць Д.л. у Беларусі пабольшала за кошт пераводу цяглых сялян у дваровыя. Паводле рэформы 1861 Д.л. атрымалі асабістую свабоду без зямельнага надзелу.

ДВАРЦО́ВАЯ ПЛО́ШЧА ў Санкт-Пецярбургу, галоўная плошча горада, асн. звяно ў сістэме арх. ансамбляў яго цэнтра. Пачаткам фарміравання Д.п. стаў будынак *Зімняга палаца* (1754—62, арх. В.В.Растрэлі). У канцы 18 ст. паўд. бок плошчы рэканструяваны паводле праекта Ю.М.Фельтэна. Была намечана дугападобная форма плошчы, канчаткова замацаваная будынкам грандыёзнага будынка Гал. штаба (1819—29, арх. К.І.Росі) з двайной праезнай аркай, у завяршэнні якой манум. каляснiца. Зімні палац, арка Гал. штаба, Аляксандраўская калона надалі плошчы ўрачысты манум. характар. У 1837—43 з усх. боку Д.п. пастаўлены будынак Штаба гвардз. корпуса (арх. А.П.Брулоў). З З плошча раскрыта ў бок былой Адміралцейскай пл. і ўключаецца ў адзіны комплекс плошчаў цэнтра горада.

Літ.: Серпокрыл С.М. Дворцовая площадь: (Архитектура). Л., 1973.

ДВАРЦО́ВЫЯ СЯЛЯ́НЕ, феадальна залежныя сяляне ў Расіі ў 12—18 ст. Належалі вял. князю, цару і асобам царскай фамілії. Землі, населеныя Д.с.,

Дварцовая плошча ў Санкт-Пецярбургу.

наз. дварцовымі. Асн. форма павіннасцей — *аброк* і *паншчына*. Паводле *пісцовых кніг* 16 ст., дварцовыя землі існавалі ў 32 паветах еўрап. ч. Расіі. З ростам тэр. Расіі колькасць Д.с. павялічвалася (у 1700 каля 100 тыс. двароў), у 18 ст. — за кошт далучаных прыбалт., укр. і бел. зямель. У 1753 б. частка Д.с. вызвалена ад паншчыны і натуральных павіннасцей і пераведзена на грашовы аброк, іх эканам. становішча ў параўнанні з прыватнаўласніцкімі сялянамі палепшылася (мелі большую свабоду ў гасп. дзейнасці і інш.). З 1979 наз. *удзельнымі сялянамі*.

ДВАРЧА́НІН Ігнат Сымонавіч (8.6.1895, в. Погіры Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. — 8.12.1937), бел. літ.-знавец, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Скончыў Пражскі ун-т (1925) са ступенню д-ра філасофіі. З 1912 настаўнік. У 1915—17 на вайсковай службе. У 1918 сакратар культ.-асв. аддзела Бел. нац. камісарыята ў Маскве. У 1919—20

І.С.**Дварчанін**.

вёў культ.-асв. работу ў Дзятлаўскім пав., за што зняволены ўладамі Польшчы ў Беластоцкі канцлагер. У 1921 арганізаваў у Даўгаўпілсе бел. настаўніцкія курсы, дзе чытаў лекцыі па бел. мове і л-ры, стварыў бел. тэатр, калектыў і хор. З 1926 у Вільні. Выкладаў бел. л-ру ў бел. гімназіі. Выконваў даручэнні Цэнтр. сакратарыята Бел. сялянска-рабочай грамады. Уваходзіў у Гал. ўправу ТБШ (1926—30). У 1928 выбраны паслом у польскі сейм па спісе рабоча-сялянскага блока. У выступленнях на сейме, мітынгах абараняў сац. і нац. правы народа Зах. Беларусі. Адзін з арганізатараў, нам. старшыні рэв.-дэмакр. і нац.-вызв. арг-цыі «*Змаганне*» (1928—30). За рэв. дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны, у 1930 засуджаны на 8 гадоў турмы. У выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай з 1932 у Мінску. Працаваў у АН БССР (у камісіі па вывучэнні Зах. Беларусі). У 1933 рэпрэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956. Дэбютаваў вершамі ў 1917. Вершы Д. публікаваліся ў час. «Наш шлях», «Прамень», «Студэнцкая думка» і інш. У іх балючы драматызм, горкая развага пра нягоды і страты свайго народа, рамантычная вера ў светлы дзень. Публіцыстыка Д. — яркая старонка барацьбы за адраджэнне нац. культуры, сац. і нац правоў роднага народа. У 1927 выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)», якая адыграла вял. ролю ў школьным навучанні і патрыят. выхаванні. Пад псеўд. І.Гудок пераклаў на бел. мову паэму А.Блока «Дванаццаць» (Вільня, 1926).

Тв.: [Вершы] // Ростані волі. Мн., 1990; Бел. пер. — Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве. Мн., 1991.

Літ.: Бергман А. Ігнат Дварчанін // Беларускі каляндар 1978. Беласток, 1978; Крывіцкі Л. (Л.А.Луцкевіч) Адкапаў праўду Беларусі // Беларускі каляндар, 1982. Беласток, 1982; Міско Я. «Ласкі панскай не трэба...» // Міско Я. Маё маўклівае сэрца. Мн., 1983; Наднёманскія былі. Мн., 1968. С. 72—75. *А.М.Пяткевіч.*

ДВАРЫЁНАС, Дваронас (Dvarionas) Баліс Дамініка (19.6.1904, г. Ліепая, Латвія — 23.8.1972), літоўскі кампазітар, дырыжор, піяніст, педагог. Засл. дз. маст. Літвы (1947). Нар. арт. СССР (1954). Скончыў Лейпцыгскую кансерваторыю па класах фп. (1924) і дырыжыравання (1939, экстэрнам). З 1928 выступаў як піяніст. У 1935—38 гал. дырыжор сімф. аркестра Літ. радыё ў Каўнасе, у 1940—41 і 1958—61 — сімф. аркестра Літ. філармоніі, з 1946 і рэсп. свят песні. З 1926 выкладаў у Каўнаскім муз. вучылішчы, з 1933 у Каўнаскай, з 1949 у Літ. (з 1947 праф.) кансерваторыях.

Сярод твораў: опера «Даля» (1959); балет «Сватанне» (1933); кантата «Прывітанне Маскве» (1954); сімфонія (1947), 2 уверцюры (1946, 1967); канцэрты з аркестрам для фп. (1960, 1962), скрыпкі (1948), валторны (1963) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1952. Дзярж. прэмія Літвы 1960.

ДВАРЫ́ШЧА, 1) на Беларусі ў 14—16 ст. (пераважна на Піншчыне) гаспадарчая адзінка і аб'ект абкладання сялян феад. павіннасцямі. Першапачатковыя Д. мелі прыблізна аднолькавую колькасць зямлі, на якой размяшчалася адна сял. гаспадарка — *дым*. З павелічэннем колькасці насельніцтва і зямлі да 16 ст. яны ўжо не былі аднолькавыя (у сярэднім уключалі 2—4 дымы). Гаспадары асобных Д. часта былі родзічамі, трапляліся і чужыя людзі. Тэр. Д. звычайна мела сваю назву, была акрэслена пэўнымі межамі. Распаду Д. і ўзнікненню сял. гаспадарак у складзе адной сям'і садзейнічала «*Устава на валокі*» 1557. 2) У Стараж. Русі двор землеўладальніка — дом з гасп. пабудовамі. Д. называлі таксама сельскае паселішча, сяло, вёску. На Беларусі ёсць вёскі з назвамі Дворышча, Дварышча. 3) Месца, дзе некалі быў двор.

ДВАРЭ́ЦЦ, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Моўчадзь. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 13 км на ПдУ ад Дзятлава, 178 км ад Гродна, 7 км ад чыг. ст. Наваельня. 810 ж., 302 двары (1997).

Вядомы з пач. 15 ст. У 15—16 ст. належаў кн. Фёдару Даўголдавічу, Свідрыгайлу, Кежгайлам, Гарнастаям. У 1516 мястэчка Навагрудскага пав. У канцы 16 ст. перайшоў да Завішаў. З 1795 у Рас. імперыі, цэнтр воласці ў Слонімскім пав. У 1870-я г. 547 ж., 77 двароў, 2 царквы, касцёл, капліца, 2 яўр. малітоўныя дамы, школа, багадзельня, 9 крам, 3 шынкі, праводзіліся 2 кірмашы штогод. У пач. 20 ст. 1373 ж. У 1921—39 у Польшчы, у Слонімскім пав. З 1939 у БССР, цэнтр сельсавета Дзятлаўскага р-на. У 1962—65 у Навагрудскім р-не. У 1971 — 609 ж., 222 двары.

Ільнозавод, дрэваапр. прадпрыемства «Палац». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры — вадзяны млын (канец 19 — пач. 20 ст.), касцёл (1904) і Пакроўская царква (пач. 20 ст.).

ДВАРЭ́ЦЦ, вёска ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе р. Цна, на аўтадарозе Брэст—Гомель. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км ад горада і чыг. ст. Лунінец, 250 км ад Брэста. 1399 ж., 418 двароў (1997). Цэх па перапрацоўцы с.-г. прадукцыі. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ДВАРЭ́ЦЦ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Добасна, на аўтадарозе Рагачоў—Бабруйск. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 22 км на З ад горада і чыг. ст. Рагачоў, 143 км ад Гомеля. 673 ж., 239 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — Троіцкая царква (2-я пал. 19 ст.).

ДВАЦЦА́ТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 20—23.9.1952 у Мінску. Прысутнічала 711 дэлегатаў з рашаючым і 145 з дарадчым голасам ад 127 436 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КП(б)Б (М.С.Патолічаў), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (В.Я.Сядых); абмеркаванне праектаў ЦК ВКП(б) «Дырэктывы XIX з'езда партыі па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1951—1955 гг.» (М.В.Зімянін) і «Тэкст зменена Статута партыі» (Ц.С.Гарбуноў); выбары ЦК КП(б)Б, Рэвіз. камісіі КП(б)Б, дэлегатаў на XIX з'езд ВКП(б). З'езд адобрыў дырэктывы XIX з'езда партыі па 5-му пяцігадоваму плану развіцця нар. гаспадаркі СССР і «Тэкст зменена Статута партыі». Выбраў ЦК КП(б)Б у складзе 127 чл. і 65 канд. у чл., Рэвіз. камісію КП(б)Б з 34 чл., 32 дэлегатаў з рашаючым і 6 з дарадчым голасам на XIX з'езд ВКП(б).

Літ.: Патолічаў М.С. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі на XX з'ездзе КП(б)Б. Мн., 1952; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 4. 1945—1955. Мн., 1986.

ДВАЦЦА́ТЫ З'ЕЗД КПСС. Адбыўся 14—25.2.1956 у Маскве; 1349 дэлегатаў з рашаючым і 81 з дарадчым голасам прадстаўлялі 6 795 896 чл. і 419 609 канд. у чл. партыі. На з'ездзе прысутнічалі прадстаўнікі камуніст. і рабочых партый 55 краін свету. Парадак дня: даклады аб рабоце ЦК КПСС, Цэнтр. рэвіз. камісіі, дырэктывы XX з'езда КПСС па 6-м пяцігадовым плане раз-

віцця нар. гаспадаркі СССР на 1956—60; выбары цэнтр. органаў партыі. На закрытым пасяджэнні з'езд заслухаў даклад М.С.Хрушчова «Аб культе асобы і яго выніках». З'езд падвёў вынікі 5-й пяцігодкі (1951—55), адобрыў паліт. лінію і практычную дзейнасць ЦК КПСС, прааналізаваў міжнар. і ўнутр. становішча СССР, вызначыў задачы па разгортванні камуніст. буд-ва ў краіне і інш. У матэрыялах з'езда развіты найважнейшыя тэарэт. пытанні сучаснасці: пра мірнае суіснаванне дзяржаў з розным сац. ладам, пра магчымасць недапушчэння сусв. вайны, пра формы пераходу розных краін да сацыялізму і інш. З'езд даручыў ЦК КПСС выпрацаваць праект новай Праграмы партыі, унёс змены ў Статут партыі. З'езд разгледзеў пытанне аб пераадоленні культу асобы Сталіна, ліквідацыі яго шкодніцкіх вынікаў ва ўсіх галінах парт., дзярж. і ідэалаг. работы, даручыў ЦК строга прытрымлівацца нормаў парт. жыцця і прынцыпаў калектыўнасці кіраўніцтва. У адпаведнасці з рашэннямі з'езда 30.6.1956 ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў».

Літ.: XX съезд КПСС: Стеногр. отчет. Т. 1—2. М., 1956.

ДВА́ЦЦАЦЬ ВО́СЬМЫ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 4—6.2.1976 у Мінску. Прысутнічала 789 дэлегатаў ад 506 220 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КПБ (П.М.Машэраў), Рэвіз. камісіі КПБ (І.М.Макараў); аб праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады» (Ц.Я.Кісялёў); выбары ЦК КПБ, Рэвіз. камісіі КПБ. З'езд адобрыў дзейнасць ЦК КПБ па выкананні рашэнняў XXIV з'езда КПСС, заданняў 9-га пяцігадовага плана развіцця нар. гаспадаркі БССР, праект ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады» і даручыў ЦК КПБ і СМ БССР на яго аснове распрацаваць 10-ы пяцігадовы план развіцця нар. гаспадаркі БССР. Выбраў ЦК КПБ у складзе 139 чл. і 65 канд. у чл., Рэвіз. камісію КПБ з 45 чл.

Літ.: Матэрыялы XXVIII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. Мн., 1976.

ДВА́ЦЦАЦЬ ДЗЕВЯ́ТЫ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 27—29.1.1981 у Мінску. Прысутнічала 796 дэлегатаў ад 595 311 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КПБ (Ц.Я.Кісялёў), Рэвіз. камісіі КПБ (Дз.В.Цябут); аб праекце ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года» (А.Н.Аксёнаў); выбары ЦК КПБ, Рэвіз. камісіі КПБ. З'езд абмеркаваў і адобрыў праект ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года» і даручыў СМ БССР і інш. дзярж. органам на яго аснове распрацаваць 11-ы пяцігадовы план эканам. і сац. развіцця БССР. Выбраў ЦК КПБ у складзе 157 чл. і 71 канд. ў чл., Рэвіз. камісію КПБ з 49 чл.

Літ.: Матэрыялы XXIX з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. Мн., 1981.

ДВА́ЦЦАЦЬ ДРУГІ́ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 24—27.1.1956 у Мінску. Прысутнічала 809 дэлегатаў з рашаючым і 76 з дарадчым голасам ад 145 069 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КПБ (М.С.Патолічаў), Рэвіз. камісіі КПБ (В.Я.Сядых); абмеркаванне праекта ЦК КПСС «Дырэктывы XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1956—1960 гады» (К.Т.Мазураў); выбары ЦК КПБ, Рэвіз. камісіі КПБ, дэлегатаў на XX з'езд КПСС. З'езд адзначыў поспехі ў выкананні 5-га пяцігадовага плана развіцця нар. гаспадаркі БССР, ухваліў праект ЦК КПСС «Дырэктывы XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1956—1960 гады» і абавязаў ЦК КПБ і СМ БССР на аснове дырэктыў ЦК КПСС распрацаваць 6-ы пяцігадовы план развіцця нар. гаспадаркі БССР. Выбраў ЦК КПБ у складзе 127 чл. і 76 канд. у чл., Рэвіз. камісію КПБ з 37 чл., дэлегатаў на XX з'езд КПСС.

Літ.: Патолічаў М.С. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXII з'езду КПБ. Мн., 1956; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 5. 1956—1965. Мн., 1986.

ДВА́ЦЦАЦЬ ПЕ́РШЫ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 10—13.2.1954 у Мінску. Прысутнічала 745 дэлегатаў з рашаючым і 68 з дарадчым голасам ад 130 026 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КПБ (М.С.Патолічаў), Рэвіз. камісіі КПБ (В.Я.Сядых); выбары кіруючых органаў КПБ. З'езд падвёў вынікі выканання планаў эканам. і культ. развіцця БССР за 3 гады пяцігодкі, адзначыў поспехі і прааналізаваў недахопы. Абавязаў парт. органы накіраваць усе сілы на датэрміновае выкананне плана 5-й пяцігодкі, ажыццявіць рашэнні вераснёўскага (1953) пленума ЦК КПСС па пытаннях сельскай гаспадаркі. Выбраў ЦК КПБ у складзе 125 чл. і 74 канд. у чл., Рэвіз. камісію КПБ з 35 чл.

Літ.: Патолічаў М.С. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXI з'езду КПБ. Мн., 1954; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 4. 1945—1955. Мн., 1986.

ДВА́ЦЦАЦЬ ПЯ́ТЫ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 26—28.9.1961 у Мінску. Прысутнічала 675 дэлегатаў з рашаючым і 97 з дарадчым голасам ад 240 353 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: аб праекце Праграмы КПСС (Ф.А.Сурганаў), аб праекце Статута КПСС (П.М.Машэраў); справаздачы ЦК КПЗБ (К.Т.Мазураў), Рэвіз. камісіі КПБ (В.Я.Сядых); выбары ЦК КПБ і Рэвіз. камісіі КПБ. З'езд ухваліў распрацаваныя ЦК КПСС праекты Праграмы і Статута КПСС. Выбраў ЦК КПБ у складзе 125 чл. і 57 канд. у чл., Рэвіз. камісію КПБ з 35 чл.

Літ.: Мазураў К.Т. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXV з'езду. Мн., 1961; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 5. 1956—1965. Мн., 1986.

ДВА́ЦЦАЦЬ СЁМЫ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 22—24.2.1971 у Мінску. Прысутнічалі 753 дэлегаты з рашаючым і 41 з дарадчым голасам ад 434 527 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачныя даклады ЦК КПБ (П.М.Машэраў), Рэвіз. камісіі КПБ (І.С.Кананові́ч); аб праекце Дырэктыў XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця нар. гаспадаркі СССР на 1971—1975 (Ц.Я.Кісялёў); выбары ЦК КПБ, Рэвіз. камісіі КПБ. З'езд ухваліў дзейнасць ЦК КПБ па выкананні рашэнняў XXIII з'езда КПСС, 8-га пяцігадовага плана развіцця нар. гаспадаркі БССР. Адобрыў праект Дырэктыў XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця нар. гаспадаркі СССР на 1971—75 і даручыў ЦК КПБ і СМ БССР на яго аснове распрацаваць 9-ы пяцігадовы план развіцця нар. гаспадаркі БССР. Выбраў ЦК КПБ у складзе 135 чл. і 63 канд. у чл., Рэвіз. камісію КПБ з 41 чл.

Літ.: Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. Мн., 1971; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. 1966—1975. Мн., 1987.

ДВА́ЦЦАЦЬ ТРЭ́ЦІ З'ЕЗД КПБ (нечарговы). Адбыўся 14—15.1.1959 у Мінску. Прысутнічала 645 дэлегатаў з рашаючым і 83 з дарадчым голасам ад 187 909 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: кантрольныя лічбы развіцця нар. гаспадаркі СССР на 1959—65 і задачы Кампартыі Беларусі (К.Т.Мазураў). Падрыхтоўка да з'езда супала са святкаваннем 40-годдзя БССР і КПБ, узнагароджаннем рэспублікі другім ордэнам Леніна. У дакладзе адзначаліся вынікі эканам. развіцця Беларусі за 1956—58: аб'ём прамысл. вытв-сці павялічыўся на 41%, у лік дзеючых уступілі Мінскія з-ды аўтам. ліній, трактарных запчастак, гадзіннікавы, электратэхнічны, ацяпляльнага абсталявання, камвольны камбінат; Полацкі з-д шкловалакна, 1-я чарга Васілевіцкай, 2-я чарга Смалявіцкай ДРЭС. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў 1953—58 выраслa ў 2,2 раза, у т.л. жывёлагадоўлі ў 3,1 раза. Павялічваліся маштабы буд-ва (у 1958 пабудавана 1,7 млн. м^2 жылля, у вёсцы — 28 тыс. дамоў). Аднак дакладчык і выступаючыя ў спрэчках (24 чал.) адзначалі недахопы ў развіцці нар. гаспадаркі, культуры: невыкананне многімі прамысл. і с.-г. прадпрыемствамі даведзеных ім заданняў, марудны рост прадукцыйнасці працы, вял. выдаткі на выпуск адзінкі прадукцыі, вял. аб'ём незавершанага буд-ва і інш. З'езд ухваліў кантрольныя лічбы развіцця нар. гаспа-

даркі СССР на 1959—65 і дырэктыўныя ўстаноўкі для Беларусі. *Р.П.Платонаў.*

ДВАЦЦАЦЬ ЧАЦВЁРТЫ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 17—19.2.1960 у Мінску. Прысутнічала 702 дэлегаты з рашаючым і 90 з дарадчым голасам ад 203 447 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КПБ (К.Т.Мазураў), Рэвіз. камісіі КПБ (В.Я.Сядых); выбары ЦК КПБ і Рэвіз. камісіі КПБ. З'езд прааналізаваў дзейнасць КПБ па выкананні сямігадовага плана, патрабаваў ад парт. органаў павысіць узровень кіраўніцтва асн. галінамі нар. гаспадаркі рэспублікі. Выбраў ЦК КПБ з 115 чл. і 51 канд. у чл., Рэвіз. камісію КПБ з 33 чл.

Літ.: Мазураў К.Т. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXIV з'езду. Мн., 1960; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 5. 1956—1965. Мн., 1986.

ДВАЦЦАЦЬ ШО́СТЫ З'ЕЗД КПБ. Адбыўся 3—5.3.1966 у Мінску. Прысутнічалі 724 дэлегаты з рашаючым і 57 з дарадчым голасам ад 343 тыс. чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КПБ (П.М.Машэраў), Рэвіз. камісіі КПБ (І.П.Кожар); праект Дырэктыў XXIII з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця нар. гаспадаркі СССР на 1966—70 (Ц.Я.Кісялёў); выбары ЦК КПБ, Рэвіз. камісіі КПБ. Адобрыў палітычную работу КПБ за справаздачны перыяд, падкрэсліў, што вял. ўплыў на дзейнасць рэсп. парт. арг-цыі зрабілі кастрычніцкі, лістападаўскі (1964), сакавіцкі і вераснёўскі (1965) пленумы ЦК КПСС. Ухваліў праект Дырэктыў XXIII з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця нар. гаспадаркі СССР на 1966—70. Выбраў ЦК КПБ з 133 чл. і 59 канд. у чл., Рэвіз. камісію КПБ з 40 чл.

Літ.: Машэраў П.М. Справаздача Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXVI з'езду. Мн., 1966; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 6. 1966—1975. Мн., 1987.

ДВАЯКАДЫ́ХАЛЬНЫЯ (Dipnoi або Dipneustomorpha), надатрад лопасцяпёрых рыб. 1 сучасны атр. рагазубападобныя (Ceratodiformes), 2 сям., 6 відаў. Вядомы з сярэдняга дэвону. Жывуць у прэсных слабапраточных вадаёмах, якія перасыхаюць, Паўд. Амерыкі (амерыканскі лускаўнік, або лепідасірэн — Lepidosiren paradoxa), трапічнай Афрыкі (4 віды пратоптэраў — Protopterus) і Паўн.-Усх. Аўстраліі (рагазуб — Neoceratodus forsteri). У засуху лепідасірэн і пратоптэры ўпадаюць у спячку.

Макс. даўж. каля 2 м, маса каля 10 кг. Цела падоўжанае, сціснутае з бакоў ці вугрападобнае. У Д. жаберная і лёгачная дыханне (адсюль назва), замест плавальнага пузыра «лёгкае», што дазваляе дыхаць атм. паветрам. Прымітыўныя асаблівасці: целы пазванкоў адсутнічаюць, хорда захоўваецца ўсё жыццё, сэрца з артэрыяльным конусам, кішэчнік са спіральным клапанам, верхняя сківіца зрошчана з чэрапам (аўтастылія). Ёсць унутр. ноздры (хааны), «лёгачны» кровазварот, ніжняя полая вена, перадсэрдзе часткова падзелена на правую і левую часткі. Нераст у перыяд дажджоў. Кормяцца беспазваночнымі, рыбамі, земнаводнымі. Пратоптэры і лускаўнік — аб'екты промыслу. Рагазуб ахоўваецца.

ДВОЕЎЛА́ДДЗЕ, назва перыяду ў гісторыі Расіі паміж 1—2 сак. і 5 ліп. 1917. Склалася пасля *Лютаўскай рэвалюцыі 1917.* Адзначана паралельным існаваннем афіц. Часовага ўрада і неафіц. ўрада — Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і іх мясц. органаў. Скончылася ў выніку *ліпеньскага крызісу 1917.*

ДВОР, 1) участак зямлі пры доме, хаце, прадпрыемстве, абгароджаны плотам або сценамі будынка, тое, што і сядзіба. 2) У ВКЛ у 13—18 ст. адна з назваў сял. гаспадаркі як аб'екта і адзінкі абкладання павіннасцямі і падаткамі, адпаведнік больш пашыранаму тэрміну *дым.* 3) У ВКЛ да сярэдзіны 16 ст. назва ўласнай гаспадаркі феадала з комплексам жылых і госп. будынкаў, ворнымі землямі і інш. ўгоддзямі. Гал. прызначэннем такіх Д. была вытв-сць с.-г. прадукцыі, якая ішла на ўтрыманне феад. адміністрацыі і задавальненне ўласных патрэб феадала. Былі пашыраны гаспадарскія (велікакняжацкія) Д. — адм. ці адм.-госп. цэнтры валасцей або асобных уладанняў вял. князя. З пачаткам *валочнай памеры* паняцце Д. заменена тэрмінам *фальварак.* 4) Цэнтр. сядзіба феад. гаспадаркі (маёнтка, фальварка), дзе жыў сам уласнік ці размяшчалася яго адміністрацыя. 5) Світа манарха з прыдворных чыноў.

ДВОР НІ́ЗГАЛАВА, вёска ў Бачэйкаўскім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., паблізу р. Ула, каля шашы Чашнікі—Ула. Цэнтр калгаса. За 25 км на З ад Бешанковіч, 76 км ад Віцебска, 23 км ад чыг. ст. Чашнікі. 197 ж., 64 двары (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — сядзіба «Нізгалава» (2-я пал. 19 ст.).

ДВО́РЖАК (Dvořák) Антанін (8.9.1841, в. Нелагазевес, каля Прагі — 1.5.1904), чэшскі кампазітар, дырыжор, педагог; заснавальнік (разам з Б.*Сметанам*) чэш. муз. класікі, стваральнік нац. сімфоніі. Чл. Чэшскай акадэміі навук і мастацтваў (1890). Вучыўся ў Пражскай школе арганістаў (1857—59). У 1862—73 альтыст у аркестры Часовага т-ра, у 1873—77 царк. арганіст у Празе. Выступаў як дырыжор з выкананнем уласных твораў у Вялікабрытаніі, Расіі. З 1891 праф. Пражскай кансерваторыі (з 1901 яе кіраўнік). У 1892—95 у ЗША, праф. і дырэктар кансерваторыі ў Нью-Йорку, дзе перабудаваў сістэму муз. навучання. Амер. ўражанні адлюстраваў у сімфоніі «З Новага Свету» (1893) і інш. творах, у якіх на аснове своеасаблівага індывід. стылю ўзнавіў характар і некат. інтанацыйныя асаблівасці негрыцянскага і індзейскага муз. фальклору. Д. развіваў нац. традыцыі і зацвердзіў сусв. значэнне чэш. музыкі. Яго творы адметныя меладычным багаццем, разнастайнасцю рытму і гармоніі, маляўнічасцю інструментоўкі, стройнасцю формы. Жанравыя і рытмаінтанацыйныя асаблівасці чэш. і мараўскага муз. фальклору найб. выявіліся ў камічнай оперы «Кароль і вугальшчык» (1871), патрыятычным гімне «Нашчадкі Белай Гары» (1872), вак. «Мараўскіх дуэтах» (1875—81), асабліва ў «Славянскіх танцах» (1878—87) і «Славянскіх рапсодыях» (1878).

А.Дворжак.

Гіст. мінуламу Чэхіі і нац.-вызв. імкненням народа прысвечаны араторыя «Святая Людміла» (1886), «Гусіцкая уверцюра» (1883), музыка да драм. спектакляў. Яго оперы складаюць аснову нац. муз.-тэатр. рэпертуару: «Ванда» (1876), «Чорт і Кача» (1899), «Русалка» (1901) і інш. Найб. каштоўны ўклад у сусв. муз. культуру — яго 9 сімфоній (1865—93), якія заклалі фундамент нац. сімфанізму, канцэрты для скрыпкі (1880) і для віяланчэлі (2-і, 1895) з аркестрам. З інш. твораў: сімф. паэмы «Вадзяны», «Паўдзённіца» (абедзве 1896), камерна-інстр., у т.л. 12 стр. квартэтаў, 3 квінтэты, фп. трыо «Думкі» (1891), фп. мініяцюры; для хору з арк. «Stabat Mater», Псалм 149, Імша, Рэквіем, Te Deum і інш. Сярод вучняў Д.: І.*Сук*, О.*Недбал*, В.*Новак*.

Літ.: Бэлза И. Антонин Дворжак. М.; Л., 1949; Антонин Дворжак: Сб. ст. М., 1967; Гулинская З.К. Антонин Дворжак. М., 1973; Егорова В.Н. Симфонии Дворжака. М., 1979; Burghauser J. A. Dvořák. Praha, 1985.

ДВО́РЖАК (Dvořák) Макс (24.6.1874, г. Роўдніцы, Чэхія — 8.2.1921), аўстрыйскі гісторык мастацтва чэшскага паходжання. Чл. Венскай АН; прадстаўнік т.зв. венскай школы мастацтвазнаўства. Вучыўся ва ун-тах Прагі і Вены. З 1902 выкладаў (праф. з 1909) у Венскім ун-це. У працах, прысвечаных пераважна мастацтву сярэднявечча, Адраджэння, барока, прасачыў і абгрунтаваў залежнасць мастацтва ад духоўнага жыцця эпохі, яе філасофіі, эстэтыкі, тэалагічных поглядаў.

Тв.: Рус. пер. — Очерки по искусству средневековья. М.; Л., 1934.

ДВО́РЖАЦ Макс Аляксандравіч (16.4.1891, Віцебская вобл. — 1942), бел. вучоны ў галіне афтальмалогіі. Д-р мед. н. (1935), праф. (1936). Скончыў Варонежскі ун-т (1919). У 1924—30 у БДУ, у 1932—41 у Мінскім мед. ін-це. Навук. працы па вывучэнні ядраў воч-

ных рухальных нерваў, прафілактыцы траўмаў вачэй, этыялогіі і лячэнні трахомы, арганізацыі дапамогі хворым на вочныя хваробы.

Тв.: Профессиональные повреждения и заболевания глаз. Мн., 1937; Аб найбольш небяспечных хваробах вачэй. Мн., 1938.

ДВО́РНАЕ СЯЛО́, вёска ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 5 км на ПдУ ад горада і 8 км ад чыг. ст. Міёры, 185 км ад Віцебска. 275 ж., 95 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ДВО́РНІКАЎ Мікалай Мікалаевіч (парт. псеўд. Герасім, Роберт, Максім, Стах Тамашэвіч; 19.12.1907, г. Гомель — 16.2.1938), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. З 1929 на камсам. рабоце ў Гомелі і Гомельскай вобл., заг. аддзела і чл. Бюро ЦК

М.М.Дворнікаў.

ЛКСМБ. З 1932 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі: сакратар Беластоцкага, Брэсцкага акр. к-таў КСМЗБ, з 1933 чл. Сакратарыята, з 1935 1-ы сакратар ЦК КСМЗБ. Адзін з кіраўнікоў *Кобрынскага ўзброенага выступлення сялян 1933*. У 1937—38 удзельнічаў у нац.-рэв. вайне ў Іспаніі: камісар батальёна імя Палафокса, камандзір роты імя Т.Шаўчэнкі ў складзе інтэрнац. брыгады імя Я.Дамброўскага. Загінуў у баях каля падножжа гор Эстрамадуры.

Літ.: Драбінскі Я. Ад Гомеля да Эстрамадуры. Мн., 1971. *В.П.Ласковіч.*

ДВО́РЫЦКАЯ СЛАБАДА́, археалагічныя помнікі (селішча і курганны могільнік 10—11 ст.) каля в. Дворыцкая Слабада Мінскага р-на. На селішчы выяўлены рэшткі каля 100 жытлаў, знойдзена шмат прыназных рэчаў, вырабаў мясц. рамеснікаў, прадметы ўзбраення, кераміка з клеймамі «трызубец». Магчыма, селішча абслугоўвала валокі ці сухапутны адрэзак шляху ад р. Лошыца да гарадзішча на Менцы і прыйшло ў заняпад з пабудовай новага дзядзінца Мінска на сутаках Свіслачы і Нямігі. На курганным могільніку (21 насып), пераважна *дрыгавічоў*, пахавальны абрад трупапалажэнне. Сярод знаходак пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы, пацеркі з металу, шкла і сердаліку, ганчарны посуд, драўлянае вядро з мёдам.

ДВО́РЫШЧА, возера ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Прыпяць, за 14 км на ПдУ ад г. Калінкавічы. Пл. 0,11 км^2, даўж. 1,32 км, найб. шыр. 120 м, даўж. берагавой лініі 2,6 км. Схілы катлавіны невыразныя, пераважна разараныя. Берагі выш. да 1 м, пясчаныя. Злучана пратокай з воз. Цімошышчы, ручаём з воз. *Малое*.

ДВО́РЫШЧА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Жыжма, каля аўтадарогі Ліда—Ашмяны. Цэнтр сельсавета і эксперым. базы «Ніва». За 15 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Ліда, 125 км ад Гродна. 546 ж., 170 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДВО́РЫШЧА, вёска ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе г.п. Расоны — в. Краснаполле. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 24 км на ПдУ ад Расонаў, 170 км ад Віцебска, 26 км ад чыг. ст. Дрэтунь. 268 ж., 113 двароў (1997). Лясніцтва, базавая школа, Дом культуры, б-ка, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ДВО́РЫШЧА, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 6 км на ПдЗ ад горада і 12 км ад чыг. ст. Хойнікі, 109 км ад Гомеля. 491 ж., 255 двароў (1997). Клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ДВО́РЫШЧАНСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Маларыцкім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Маларыта, за 11 км на ПдЗ ад г. Маларыта. Пл. 0,23 км^2, даўж. 620 м, найб. шыр. 540 м, найб. глыб. 4,2 м, даўж. берагавой лініі каля 2,4 км. Пл. вадазбору 8,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 2—5 м, спадзістыя, пад лугам. Берагі нізкія, тарфяністыя. У возера з дапамогай помпаў падаецца вада з асушальных каналаў, з ПдУ выцякае ручай у р. Маларыта.

ДВУКО́ССЕ, гл. ў арт. *Знакі прыпынку*.

ДВУКРО́П'Е, гл. ў арт. *Знакі прыпынку*.

ДВУРЫ́М, верш, усе радкі якога спалучаны дзвюма рыфмамі.

ДВУХ ЦЕЛ ЗАДА́ЧА (у астраноміі), задача *нябеснай механікі* пра рух 2 цел, якія ўзаемадзейнічаюць паміж сабой пры дапамозе гравітацыйных сіл (гл. *Сусветнага прыцягнення закон*). Рашэнне Д.ц.з. паказвае, што целы (планеты) рухаюцца па адным з канічных сячэнняў (эліпс, парабала, гіпербала) паводле *Кеплера законаў*.

ДВУХА́ТАМНЫЯ СПІРТЫ́, гл. *Гліколі*.

ДВУХБАКО́ВАЯ СУ́ВЯЗЬ, спосаб *электрасувязі*, пры якім абмен інфармацыяй паміж двума пунктамі (ці карэспандэнтамі) ажыццяўляецца ў абодвух напрамках. Д.с. бывае: *дуплексная сувязь*, паўдуплексная (аўтаматызаваны пераход прыём—перадача) і *сімплексная сувязь*. Рэалізуецца шляхам частотнага, часавага ці інш. раздзялення сігналаў прамога і адваротнага напрамкаў.

ДВУХВУ́СНАЎКІ, устарэлая назва плоскіх чарвей класа *трэматод*, напр., Д. пячоначная (Fasciola hepatica), Д. крывяная (Schistosoma haematobium), Д. кашэчая, або сібірская (Opistorchis felineus), і інш. Селяцца ў органах чалавека і жывёл, выклікаюць цяжкія хваробы. Назва Д. звязана з тым, што прысоскі ў трэматод раней прымалі за 2 ротавыя адтуліны.

ДВУХГАДО́ВЫЯ РАСЛІ́НЫ, двухлетнікі, травяністыя расліны з жыццёвым цыклам (ад насення да насення) на працягу 2 гадоў. Каля 50 тыс. відаў з розных сістэм. груп. Пашыраны па ўсім зямным шары, асабліва ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. На Беларусі больш за 60 відаў. Да Д.р. належыць большасць агароднінных (цыбуля, морква, буракі, капуста і інш.), лекавыя (баркун, наперстаўка, пакрывец, блёкат і інш.), дэкар. (браткі, гваздзік турэцкі, званочак сярэдні, незабудка альпійская і інш.) віды.

У 1-ы год Д.р. развіваюць падземную і надземную вегетатыўныя часткі (корань, цыбуліну, караняплод, сцёблы, лісце), на 2-і ўтвараюць (за кошт назапашаных пажыўных рэчываў) прадаўраваты парастак з кветкамі, цвітуць, пладаносяць і адміраюць.

ДВУХГРА́ННЫ ВУ́ГАЛ, кут, фігура ў прасторы, утвораная дзвюма паўплоскасцямі, якія выходзяць з адной прамой, а таксама частка прасторы, абмежаваная гэтымі паўплоскасцямі. Паўплоскасці наз. гранямі Д. в., агульная прамая — рабром. Д. в. вымяраецца лінейным вуглом, г.зн. вуглом α, паміж двума перпендыкулярамі да рабра, што выходзяць з аднаго пункта і ляжаць у розных гранях, ці, інакш, вуглом, утвораным перасячэннем Д. в. плоскасцю, перпендыкулярнай да рабра.

ДВУХДО́ЛЬНЫЯ (Magnoliopsida, або Dicotyledones), клас кветкавых, або пакрытанасенных, раслін, гл. *Магноліяпсіды*.

ДВУХДО́МНЫЯ РАСЛІ́НЫ, віды раслін, у якіх жан. і мужч. генератыўныя (палавыя) органы знаходзяцца на розных асобінах. Кветкавыя Д.р. маюць аднаполыя песцікавыя (жан.) і тычынкавыя (мужч.) кветкі, у інш. груп Д.р. утвараюцца *архегоніі* (жан. палавыя органы) і *антэрыдыі* (мужч. палавыя органы). У флоры Беларусі Д.р. ёсць сярод кветкавых (дрэвавых — тапаля, асіна, вярба; травяністых — каноплі, шчаўе, шпінат і інш.), голанасенных (ядловец), папарацепадобных, хвошчападобных, дзеразападобных, імхоў, водарасцей. Гл. таксама *Аднадомныя расліны, Шматдомныя расліны*.



Двухгранны вугал.

ДВУХКЛА́СНЫЯ ПАЧАТКО́ВЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ, пачатковыя школы павышанага тыпу ў Рас. імперыі. Існавалі з 1870-х г. да 1918. Адкрываліся ў вял. сёлах, на чыг. станцыях і ў некат. пав. гарадах. У Беларусі працавалі паводле Часовай інструкцыі Мін-ва нар. асветы ад 4.6.1875. Тэрмін навучання 5—6 гадоў. Вучыліся пераважна дзеці сялян, гандляроў, саматужнікаў. Лепшыя вучні мелі права паступаць у настаўніцкія семінарыі, ніжэйшыя прафес.-тэхн. навуч. ўстановы. Вывучаліся Закон Божы, арыфметыка, рус. граматыка, асновы фізікі, геаметрыі, прыродазнаўства, гісторыі, чарчэння, дадаткова ўводзіліся гімнастыка, рамёствы, рукадзелле, садаводства, агародніцтва, пальводства, пчалярства. У 1914 у Віцебскай губ. дзейнічала 97, Гродзенскай — 197, Магілёўскай — 57, Мінскай — 68 Д.п.в. У 1918 пераўтвораны ў школы 1-й і 2-й ступеней.

ДВУХКРЫ́ЛЫЯ (Diptera), атрад насякомых. 3 падатр.: даўгавусыя (Nematocera) — камары, мошкі, макрацы і інш.; караткавусыя прамашвовыя (Brachycera-Orthorrhapha) — сляпні, ктыры, жужалы і інш.; караткавусыя круглашвовыя (Brachycera-Cyclorhapha) — мухі, авадні, тахіны, крывасмокі і інш. Больш за 150 сям., каля 100 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі каля 6 тыс. відаў.

Даўж. 0,3—50 мм. Афарбоўка цёмная або стракатая. Развіта адна пара (пярэдняя) крылаў (адсюль назва), задняя рэдукавана і ператварылася ў булавападобныя жужальцы. Галава круглаватая з вял. фасетачнымі вачамі. Вусікі шматчленікавыя (даўгавусыя Д.) або кароткія трохчленікавыя (караткавусыя Д.). Ротавыя органы калюча-сысучыя або ліжучыя, зрэдку рэдукаваныя. Развіццё з поўным ператварэннем; за год 1—9 генерацый. Лічынкі чэрвепадобныя, жывуць у вадзе, глебе, гнілых рэштках раслін, жывых раслінах і жывёлах, трупах. Дарослыя Д. кормяцца нектарам і пылком раслін, гнілымі рэчывамі, крывёй жывёл і чалавека (*гнюс*); некат. не кормяцца. Шэраг відаў Д. — пераносчыкі ўзбуджальнікаў хвароб чалавека і жывёл (пакаёвая муха, маскіты, камары, мошкі, сляпні і інш.). Лічынкі многіх Д. — небяспечныя шкоднікі раслін (даўганожкі, галіцы, збожжавыя мухі і інш.) і паразіты с.-г. жывёл (авадні, гнюс). Некаторыя Д. карысныя як апыляльнікі раслін (журчалкі і інш.), глебаўтваральнікі (грыбныя камарыкі і інш.), знішчальнікі шкодных насякомых (тахіны).

Літ.: Систематика и эволюция двукрылых насекомых. Л., 1977; Осмоловский Г.Е., Бондаренко Н.В. Энтомология. 2 изд. Л., 1980; Жизнь животных. Т. 3. 2 изд. М., 1984.

ДВУХЛЕ́ТНІКІ, тое, што *двухгадовыя расліны*.

ДВУХМО́ЎЕ, білінгвізм, валоданне і карыстанне 2 моўнымі сістэмамі. Адрозніваюць Д.: актыўнае (асоба валодае вуснай формай мовы і карыстаецца ёю), патэнцыяльна актыўнае (асоба валодае вуснай мовай, але працяглы час не карыстаецца ёю) і пасіўнае (асоба разумее мову, але не можа карыстацца вуснай формай); нарматыўнае, або кадыфікацыйнае (паслядоўна правільнае ўжыванне нормаў абедзвюх моў), аднабакова-нарматыўнае (асоба валодае нормамі толькі адной мовы) і ненарматыўнае (асоба не валодае нормамі ні адной мовы); чыстае (мова выбіраецца адпаведна пэўнай сітуацыі) і змешанае (асоба ў адной і той жа сітуацыі карыстаецца 2 мовамі); непасрэднае (калі мова непасрэдна звязана з мысленнем) і апасродкаванае (мова кадзіруе думкі, выказаныя першаснай мовай); двухбаковае (Д. пашыраецца сярод абодвух этнасаў, якія кантактуюць) і аднабаковае (Д. пашырана толькі ў асяроддзі аднаго з кантактуючых этнасаў); індывідуальнае, групавое, масавае, тэрытарыяльнае, пагранічнае, суцэльнае, агульнанароднае. Для білінгва (асобы) уласцівы т.зв. дамінантны механізм у адносінах да адной з моў: праз гэтую мову рэчаіснасць успрымаецца хутчэй і лягчэй, чым праз іншыя. Для большасці асоб роднай мовы з'яўляецца мова свайго этнасу.

У наш час на Беларусі найб. пашырана бел.-рус. Д. Для шэрагу раёнаў характэрны тып Д. і *шматмоўя*, пры якім адна з моў — беларуская (бел.-лат., бел.-літ., бел.-польск., бел.-ўкр., бел.-рус.-ўкр. і г.д.). Сярод беларусаў, якія жывуць за мяжой, найб. пашыраны такія тыпы Д.: бел.-польск. (Польшча), бел.-англ. (Канада, ЗША), бел.-іспанскае (Лац. Амерыка). *Ф.Д.Клімчук.*

ДВУХМО́ЎНЫ СЛО́ЎНІК, перакладны слоўнік, тып лінгвістычнага даведніка, у якім змест слоў адной мовы перадаецца сродкамі іншай мовы. Часцей за ўсё гэта робіцца шляхам перакладу: напр., «Практычны расійска-беларускі слоўнік» М.Я.Байкова і М.І.Гарэцкага (1924). Больш глыбокая і навук. семантызацыя зместу рэестравых слоў ажыццяўляецца ў тых Д.с., якія змяшчаюць да слоў адной мовы разгорнутыя дэфініцыі на іншай (напр., «Кароткі эканамічны слоўнік», 1993). Існуюць і больш апасродкаваныя спосабы семантызацыі, напр. у Д.с. ідэаграфічнага тыпу; так, у «Тэматычным руска-беларускім слоўніку мовы навуковых справаздач» (1993) словы не толькі перакладаюцца, але і ілюструюцца эквівалентнымі па зместу тэкставымі фрагментамі на рус. і бел. мовах, дзе гэтыя словы ўжываюцца. Існуюць Д.с., у якіх сумяшчаюцца ўсе магчымыя спосабы семантызацыі рэестравых слоў: «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» В.Ластоўскага (1990).

Паводле характару рэестравых адзінак адрозніваюць Д.с. агульныя («Руска-беларускі слоўнік», т. 1—3, 6-е выд., 1995; «Беларуска-рускі слоўнік», т. 1—2, 2-е выд., 1988—89) і спецыяльныя або тэрміналагічныя («Руска-беларускі слоўнік матэматычных, фізічных і тэхнічных тэрмінаў» М.М.Касцюковіча, У.В.Люшціка, В.К.Шчэрбіна, 1995). Паводле прызначэння вылучаюць агульныя і школьныя Д.с. (напр., «Руска-беларускі слоўнік», 6-е выд., 1993, і «Беларуска-рускі слоўнік», 3-е выд., 1991, С.М.Грабчыкава; «Руска-беларускі слоўнік: Для пачатковых класаў» А.К.Кобызевай, Г.П.Хаткевіч і М.Я.Шчарбун, 1985). Паводле характару інфармацыі аб рэестравых словах адрозніваюць агульныя і аспектныя, сярод апошніх Д.с. моўных цяжкасцей, паралексічныя Д.с. (гл. адпаведныя арт.). *В.К.Шчэрбін.*

Двухкрылыя: 1 — камар звычайны; 2 — званец апушаны; 3 — ільвінка звычайная; 4 — чмеляўідка празрыстая; 5 — журчалка цыбульная; 6 — сляпень бычыны; 7 — жужала разнаколерны; 8 — муха падлавая звычайная; 9 — зеленавочка збожжавая; 10 — тахіна вялікая.

ДВУХПАЛА́ТНАЯ СІСТЭ́МА, у дзяржаўным праве наяўнасць у складзе прадстаўнічага органа дзвюх палат — верхняй і ніжняй, якія дзейнічаюць раздзельна. Узнікла ў 13 ст. ў Англіі, парламент якой меў *палату лордаў* і *палату абшчын*. У практыцы парламентарызму фарміраванне палат адбываецца па-рознаму: верхняя палата фарміруецца пераважна шляхам назначэння ці спадчынна (палата лордаў у Вялікабрытаніі) або шляхам непрамых выбараў (сенат у Францыі); ніжняя — шляхам прамых выбараў насельніцтвам. У Рэспубліцы Беларусь з ліст. 1996 заснаваны парламент — Нацыянальны сход, які складаецца з дзвюх палат: Палаты прадстаўнікоў, якая выбіраецца насельніцтвам на аснове ўсеагульнага выбарчага права, і Савета Рэспублікі — палаты тэр. прадстаўніцтва, члены якога выбіраюцца на мясц. Саветах дэпутатаў (па 8 ад кожнай вобласці і г. Мінска) і прызначаюцца Прэзідэнтам дзяржавы (8 членаў). Гл. таксама *Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь*.

ДВУХПАРНАНО́ГІЯ (Diplopoda), клас мнаганожак. 13 атр., у т.л. *кіўсякі* (3 атр.). Каля 50 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды. Наземныя жывёлы, жывуць у месцах з павышанай вільготнасцю: лясным подсціле, глебе, пад камянямі або бярвёнамі і інш. На Беларусі найб. пашыраны прадстаўнікі атр. *касцянак* і гроначнікаў. У Белавежскай пушчы 15 відаў, з якіх дамінуюць стронгілазома чорная (Strongylosoma pallipes) і гламеры конекса (Glomeris connexa).

Цела выцягнутае, цыліндрычнае, падзелена на галаву і сегментаванае тулава, большасць членікаў якога мае 2 пары ног (адсюль назва). У большасці 1—2 ядавітыя залозкі. Развіццё з анамарфозам. Кормяцца гніючымі раслінными рэшткамі. Удзельнічаюць у глебаўтварэнні, спрыяюць гуміфікацыі і мінералізацыі адмерлых ч. раслін. Некат. пашкоджваюць карэнні с.-г. раслін.

ДВУХПАРТЫ́ЙНАЯ СІСТЭ́МА, палітычная сістэма, пры якой дзве найбуйнейшыя партыі перыядычна змяняюць адна адну ва ўладзе. Характэрна для ЗША (рэсп. і дэмакр. партыі), Вялікабрытаніі (кансерватыўная і, да 1920-х г., ліберальная, потым лейбарысцкая), Канады (ліберальная і прагрэс.-кансерватыўная) і некат. іншых краін. Д.с. не выключае існавання іншых паліт. партый і арг-цый.

ДВУХПО́ЛАВАСЦЬ, гл. *Гермафрадытызм*.

ДВУХПО́ЛЫЯ КВЕ́ТКІ, кветкі, у якіх ёсць і жаночыя, і мужчынскія генератыўныя (палавыя) органы — тычынкі і песцікі. Д.к. маюць некат. віды з родаў суніцы, ружа, яблыня.

ДВУХПО́ЛЮСНАЕ ТЭЛЕГРАФАВА́ННЕ, тэлеграфаванне пастаянным токам, калі па лініях сувязі пасылкі аднаго напрамку (палярнасці) току перадаюцца ўслед за пасылкамі процілеглага напрамку. У параўнанні з *аднаполюсным тэлеграфаваннем* мае павялічаную скорасць перадачы, меншыя скажэнні знакаў, меншы ўплыў умоў надвор'я і інш. Выкарыстоўваецца для далёкай тэлеграф. сувязі па правадах.

ДВУХПЯЛЁСНІК (Circaea), род кветкавых раслін сям. скрыпнёвых. 12 відаў. Пашыраны ва ўмераных і халодных абласцях Паўн. паўшар'я. На Беларусі трапляюцца 2 віды: Д. альпійскі (C. alpina) і парыжскі, або вядзьмак-трава (C. lutetiana). Растуць у сырых і цяністых лясах, у хмызняках, ярах, на пнях і калодах. Утвараюць гібрыдную форму — Д. прамежкавы (C. intermedia).

Шматгадовыя травяністыя расліны з паўзучым карэнішчам і прамастойным або ўзыходным простым ці галінастым сцяблом. Лісце супраціўнае, суцэльнае, на чаранках, яйца- ці сэрцападобнае. Кветкі дробныя, белыя, ружаватыя ці бэзаватыя, у канцавых простых або галінастых гронках. Вяночак з 2 адваротнаяйцападобных пялёсткаў (адсюль назва). Плод арэшкападобны, 1—2-гнездавы, укрыты кручкападобна сагнутымі валаскамі. Лек. і фарбавальныя расліны. *Г.У.Вынаеў.*

Двухпялёснік парыжскі.

ДВУХРАДКО́ЎЕ, найбольш просты від *страфы*, які складаецца з двух радкоў, звязаных сумежнай рыфмоўкай ці клаўзацыяй (у белым вершы). З'яўляецца асновай монастрафічнага верша-двухрадковіка. У ант. паэзіі Д. пэўнага памеру ўтварылі асобую страфу — *элегічны двуверш*. У паэзіі народаў Б. і Сярэдняга Усходу Д. мае назву *бейт*. Нярэдка ўваходзіць састаўной ч. у больш буйныя страфічныя формы (чатырохрадкоўі, шасцірадкоўі, васьмірадкоўі — аабб, ааббвв, ааббввгг), служыць *кодай* у некат. класічных відах строф (*санеце* шэкспіраўскага тыпу, *актаве, анегінскай страфе*). *В.П.Рагойша.*

ДВУХРЭ́ЧЧА, пашыраная назва *Месапатамій*.

ДВУХСКЛА́Д, тое, што *біном*.

ДВУХСКЛАДО́ВЫЯ ПАМЕ́РЫ, у *сілаба-танічным вершаскладанні* памеры, у якіх націскныя склады чаргуюцца з ненаціскнымі ў цотным (*ямб*) ці няцотным (*харэй*) парадку. У метрычным вершаскладанні Д.п. ўтварае спалучэнне доўгага склада з кароткім, кароткага з доўгім, двух доўгіх і двух кароткіх.

ДВУХСТВО́РКАВЫЯ МАЛЮ́СКІ, пласціністашчалепныя малюскі (Bivalvia, Lamellibranchia), клас водных беспазваночных малюскаў. 3 надатр., 14 атр., 130 сучасных сям., каля 1 тыс. родаў, 20 тыс. відаў. Пашыраны ў прэсных вадаёмах, саленаватых азёрах, у акіянах і морах Еўразіі, Амерыкі, Афрыкі. Донныя маларухомыя жывёлы. На Беларусі найб. вядомы прадстаўнікі з родаў гарошынкі і шароўкі (каля 30 відаў), *бяззубкі* і *перлаўкі*; жамчужніца звычайная занесена ў Чырв. кнігу.

Двухстворкавыя малюскі: 1 — марская жамчужніца; 2 — спандылюс прыгожы; 3 — амусіум японскі; 4 — бяззубка вузкая; 5 — шароўка рачная; 6 — шароўка азёрная.

Даўж. 2—3 мм — 1,5 м, маса да 250 кг (*трыдакна*). Ракавіна з 2 створак (адсюль назва). На спінным баку створкі звязаны эластычнай перамычкай (лігаментам), унутры — 1—2 мышцамі-замыкальнікамі (адуктарамі). У большасці Д.м. патоўшчаны спінны край створак мае выступы (зубы), сукупнасць якіх утварае т.зв. замок. Створкі ракавіны ўнутры высланы 2 скурнымі складкамі — «мантыяй», між імі і целам мантыйная паласць. У некат. Д.м. (*жамчужніцы, мідыі*, бяззубкі) іншародныя часцінкі, што трапляюць у паласць, абвалакваюцца слаямі перламутру і пераўтвараюцца ў жэмчуг. На брушным баку цела ў большасці Д.м. ёсць мускулісты выраст — нага, у многіх з бісусавай залозай, якая выдзяляе трывалыя ніці (бісус), з іх дапамогай малюск прымацоўваецца да субстрату. Пераважна раздзельнаполыя, апладненне вонкавае. Біяфільтратары. Кормяцца планктонам або дэтрытам. Корм рыб і марскіх жывёл. Аб'екты промыслу і аквакультуры.

ДВУХХВО́СТКІ, вілахвосткі (Diplura), атрад насякомых падкл. першаснабяскрылых. 3 сям.: кампадэіды

(Campodeidae), япігіды (Japy idae), праяпігіды (Projapy idae). 40 родаў, 600 відаў. Пашыраны пераважна ў трапічных і субтрапічных абласцях. Жывуць у глебе, лясным подсціле, мурашніках, гнілой драўніне, пад камянямі. На Беларусі найб. вядомыя кампадэя стафілінападобная (Campodea taphyli u) і клешчахвост звычайны (Catajapyx co fu u).

Цела даўж. 2—8 мм, зрэдку да 50 мм, прадаўгаватае, малочна-белае, жаўтаватае, густа ўкрытае валаскамі. Галава круглаватая з доўгімі шматчленікавымі антэнамі; ротавыя часткі грызучыя. 3 пары ног. На заднім канцы цела парныя, як вілы, адросткі (адсюль назва). Пераважна драпежнікі (жывяцца дробнымі членістаногімі). Развіццё без пераўтварэння, лічынкі і дарослыя шмат разоў ліняюць.

ДДТ, дыхлордыфенілтрыхлорэтан, хімічны прэпарат для барацьбы са шкоднымі насякомымі (*інсектыцыд*). Шырока выкарыстоўваўся ў 1940—60-я г. ў многіх краінах свету. Устойлівае злучэнне, якое здольна назапашвацца ў навакольным асяроддзі, забруджваць яго і парушаць біял. раўнавагу ў прыродзе; небяспечнае для чалавека і жывёл (выклікае хранічнае атручэнне). Забаронены (на Беларусі — з 1970).

«ДЕНЬ», грамадска-літаратурная газета. Выдавалася ў 1861—65 у Маскве штотыднёва на рус. мове. Орган славянафілаў. Асвятляла, пераважна з пазіцый славянафільства, праблемы гісторыі і жыцця слав. народаў. Змяшчала інфарм. матэрыялы, гіст. і публіцыст. артыкулы, літ. творы. Асабліва вылучала бел. пытанне. Публікавала арт. Я.А.Балвановіча, А.Ф.Гільфердзінга, В.А.Ялагіна і інш. пра бел.-польскія і бел.-рус. узаемаадносіны. М.В.Каяловіч даў гіст., тэарэт. і ідэалагічнае абгрунтаванне канцэпцыі *заходнерусізму* (арт. «Люблінская унія Літвы з Польшчай у 1569 г.», «Літва і Беларусь», «Аб адносінах рускага грамадства да Заходняй Расіі» і інш.). Характар асвятлення бел. тэмы ад знешне памяркоўнага (1861—62) змяніўся на агрэсіўна шавіністычны пасля паўстання 1863—64. *С.А.Кузняева.*

ДЖ, графема ў бел. алфавіце для абазначэння асобнага складанага гука. Дыграф, утвораны з літар «д» і «ж», перадае афрыкату «дж». У пісьмовых помніках выкарыстоўваецца з 16 ст., аднак старабел. аўтарамі гук «дж» часцей перадаваўся літарамі «ч», «ж», спалучэннямі «д» і «ч», «ж» і «ч» («ъздживаль», «розъежчалъ», «приеждчий»). У сучаснай бел. літ. мове спалучэнне «дж» вымаўляецца па-рознаму: у словах тыпу «аджыць», «паджылкі», дзе «д» — частка прыстаўкі, а «ж» — пачатковы гук кораня, «дж» чытаецца як спалучэнне 2 гукаў «д» і «ж» («ад-жыць»); у выпадку, калі «д» і «ж» не стаяць на стыку 2 марфем, яны вымаўляюцца як адзін непадзельны гук («джунглі», «загароджаны», «ураджай»). *М.Р.Прыгодзіч.*

ДЖАБАЛПУ́Р, горад у цэнтр. ч. Індыі, у вярхоўі р. Нармада, у штаце Мадх'я-Прадэш. Засн. ў 1-й пал. 19 ст. як англійская ваен. база. 764,6 тыс. ж. (1991). Вузел чыгунак і аўтадарог. Гандл.-прамысл. цэнтр. Прам-сць: тэкст., керамічная, шкляная, гумавая, лесапільная, металаапр., аўтамабілебудаўнічая. Гандаль драўнінай. Ун-т.

ДЖАБА́РАЎ Джуманіяз (н. 25.11.1930, кішлак Пулаты Кашкадар'інскай вобл., Узбекістан), узбекскі паэт. Засл. дз. маст. Узбекістана (1980). Скончыў Сярэднеазіяцкі ун-т (Ташкент, 1952). Друкуецца з 1950. Аўтар зб-каў паэзіі «Я слаўлю Радзіму» (1953), «Подых вясны» (1956), «Рэха гор» (1961), «Сшытак дваццаці дзён» (1967), «Хвіліны натхнення» (1971) і інш. Вядомы як перакладчык і драматург. Пераклаў на ўзб. мову асобныя творы Я.Купалы. На бел. мову асобныя творы Дж. пераклалі Р.Барадулін, В.Іпатава.

Тв.: Рус. пер. — Родное тепло. Ташкент, 1982; Убежденность. Ташкент, 1982.

ДЖАБАРЛЫ́ Джафар (20.3.1899, в. Хізы Апшэронскага р-на, Азербайджан — 31.12.1934), азербайджанскі пісьменнік, рэжысёр. Засл. дз. маст. Азербайджана (1932). Скончыў Азербайджанскі ун-т (1929). Друкаваўся з 1915. Выступаў у жанрах апавядання, сатыр. верша, п'есы. Сярод твораў: гіст. драмы «Насрэддзін-шах» (1916), «Нявеста агню» (паст. 1928), п'есы «Айдын», «Актай Эль-аглы» (паст. 1922—23), «Алмас» (паст. 1931), «Яшар» (паст. 1932) і інш. Вастрыня драм. канфліктаў, па-майстэрску пабудаваны дыялог — адметныя рысы яго твораў. Аўтар лібрэта опер, кінасцэнарыяў, літ.-крытычных артыкулаў. Пераклаў на азерб. мову асобныя творы Я.Купалы.

Тв.: Рус. пер. — Пьесы. Баку, 1969.

ДЖАБЕ́РЦІ (ioberti) Вінчэнца (5.4.1801, г. Турын, Італія — 26.10.1852), італьянскі тэолаг і філосаф, дзярж. дзеяч. Свяшчэннік. У 1825—33 праф. Турынскага ун-та. За сувязь з Дж.*Мадзіні* праследаваўся ўладамі, у 1833—48 у эміграцыі ў Францыі і Бельгіі. У рэвалюцыю 1848—49 у Італіі прэм'ер-міністр *Сардзінскага каралеўства*, сардзінскі пасол у Францыі, у 1849 эмігрыраваў у Парыж, дзе і памёр. Аўтар прац «Пра духоўнае і грамадзянскае пяршынствы італьянцаў» (1843), «Пра грамадзянскае абнаўленне Італіі» (т. 1—2, 1851), прысвечаных праблеме *Рысарджымента* і інш.

ДЖАВАХЕ́ЦКАЕ НАГО́Р'Е, у Закаўказзі (Грузія), частка Паўд.-Груз. нагор'я, на Пд ад Трыялецкага хр., паміж р. Кура на З і Ніжнекартлійскай раўнінай на У. Уключае Самсарскі і Джавахецкі мерыдыянальныя хрыбты (выш. да 3300 м) і плато Цалкінскае, Гамарэцкае, Дманіскае і Ахалкалакскае (выш. да 1700 м). Складзена з андэзіта-базальтавых і трахітавых лаў. У катлавінах шмат азёр тэктанічнага ці вулканічнага паходжання (Паравані, Табацкуры і інш.). Горныя стэпы, субальпійскія лугі, якія выкарыстоўваюцца як пашы.

ДЖАВАХІШВІ́ЛІ М. (сапр. Адамашвілі Міхаіл Савіч, 20.11.1880, с. Цэракві Марнеульскага р-на, Грузія — 1937), грузінскі пісьменнік. Друкаваўся з 1903. Выступаў з апавяданнямі, артыкуламі супраць самадзяржаўя, за што быў прыцягнуты да суд. адказнасці. З-за праследаванняў у 1907 выехаў за мяжу, падарожнічаў па Еўропе і Амерыцы. Пасля вяртання на радзіму ў 1909 выдаваў час. «Эры» («Нацыя»), які неўзабаве быў забаронены, а Дж. засуджаны да турэмнага зняволення, пазней — ссылкі. Аўтар сатыр. раманаў «Квачы Квачантырадзе» (1924), «Гіві Шадуры» (1928), гіст. «Арсен з Марабды» (1932), «Лёс жанчыны» (1936), адметных актуальнасцю тэматыкі і праблематыкі, майстэрствам сюжэтнай кампазіцыі, паглыбленым псіхалагізмам. Рэпрэсіраваны, рэабілітаваны пасмяротна. На бел. мову асобныя творы Дж. пераклаў А. Жук.

Літ.: Радиани Ш. Михаил Джавахишвили. Тбилиси, 1958.

ДЖАГА́РАЎ Барыс Міхайлавіч (н. 21.11.1943, в. Чырвоны Бераг Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1989). Скончыў БДУ (1965). З 1968 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па спектраскапіі і фотахіміі біямалекул, у т.л. хларафілу і гему крыві. Даследаваў фотафіз. і фотахім. працэсы з удзелам малекулярнага кіслароду, механізм і дынаміку аксігенацыі гемаглабіну.

Тв.: Пикосекундная динамика размена энергии электронного возбуждения в металлопорфиринах (разам з У.С.Чырвоным, Г.П.Гурыновічам) // Лазерная пикосекундная спектроскопия и фотохимия биомолекул. М., 1987.

ДЖАГАТА́Й, Чагатай (? — 1242), мангольскі хан. Другі сын *Чынгісхана*, удзельнік большасці яго заваёўніцкіх паходаў. Пасля падзелу бацькам заваяваных зямель паміж сынамі (1224) Дж. атрымаў сярэднеазіяцкія вобласці ад Алмалыка да Амудар'і і Сырдар'і [гл. *Джагатайскі* (*Чагатайскі*) *улус*]. Стаўка Дж. знаходзілася ў даліне р. Ілі. У манг. дзяржаве Дж. быў лепшы знаўца манг. звычаёвага права, на сваіх землях патрабаваў строгага выканання манг. законаў.

ДЖАГАТА́ЙСКІ (ЧАГАТА́ЙСКІ) УЛУ́С, спадчыннае ўладанне манг. ханаў з роду *Джагатая*. Вылучыўся з Мангольскай імперыі ў 1224, уключаў сярэднеазіяцкія землі (Маверанахр, Сямірэчча і Кашгар). Пасля Курултая 1251 і ўступлення на прастол Мункэ большасць дарослых прадстаўнікоў дынастыі Джагатаяў была закатавана. У 1260-я г. ўнук Джагатая Алгу аднавіў ва улусе ўладу Джагатаяў. У 1340-я г. улус фактычна распаўся на шэраг феад. уладанняў. Пасля ўтварэння дзяржавы *Цімура* ўлада Джагатаяў спынілася.

ДЖАГДЫ́, хрыбет ва ўсх. ч. горнага ланцуга Тукурынгра-Джагды. Выш. да 1593 м. Гл. *Тукурынгра*.

ДЖАГІ́Р, найбольш пашыраная форма феад. землекарыстання ў *Маголькай імперыі* ў Індыі ў 16—18 ст. Сярэдні памер Дж. быў вялікі (да 100 тыс. га). Уладальнік (джагірдар) атрымліваў долю дзярж. зямельнага падатку з Дж. на сваю карысць, за гэта быў абавязаны ўтрымліваць атрад наёмных коннікаў. У 1574 *Акбар* спрабаваў ліквідаваць сістэму Дж., што выклікала супраціўленне мусульм. джагірдараў. У 17 ст. ўзнікла тэндэнцыя да перараджэння Дж. ў спадчыннае валоданне (ажыццяўлялася ў 18 ст.).

ДЖАДЗІДЫ́ЗМ (ад араб. джадзід — новы), культурна-рэфарматарскі, асветны і грамадска-паліт. рух мусульман Паволжа, Крыма і Сярэдняй Азіі ў канцы 19 — пач. 20 ст. Джадзіды выступалі за пашырэнне сеткі мусульм. культ.-асв. устаноў, выданне кніг, часопісаў, газет на нац. мове, развіццё нац. мастацтва і л-ры, рэарганізацыю мусульм. духавенства. Быў распрацаваны праект школьнай рэформы, у пач. 1880-х г. адкрыта першая джадзідская школа ў Бахчысараі, потым школы дзейнічалі ў Турцыі, Персіі, Індыі, Кітаі. У рэвалюцыю 1905—07 джадзіды выступалі з патрабаваннямі рэформаў паліт. ладу краіны, арганізоўвалі паліт. стачкі, антыўрадавыя дэманстрацыі. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 частка джадзідаў прызнала сав. ўладу, інш. сталі ініцыятарамі стварэння ў Туркестане аўтаномнага ўрада (гл. *Какандская аўтаномія*), удзельнічалі ў *басмацтве*, мелі сувязі з *белай гвардыяй*, пазней эмігрыравалі.

ДЖАДХПУ́Р, горад на ПнЗ Індыі, у штаце Раджастхан. Засн. ў сярэдзіне 15 ст. Каля 700 тыс. ж. (1994). Чыг. вузел. Вытв-сць тканін, скураных, фармацэўтычных, метал. вырабаў; маст. рамёствы (апрацоўка слановай косці, выраб упрыгожанняў са шкла, лакавых сувенірных рэчаў, культавага адзення і інш.). Гар. ўмацаванні і цытадэль 16 ст.

ДЖА́ЕВЕР (Giaever) Айвар (н. 5.4.1929, г. Берген, Нарвегія), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША. Скончыў Нарвежскі тэхнал. ін-т (1952). З 1956 у ЗША. Працаваў у кампаніі «Джэнерал электрык», Кембрыджскім ун-це. Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела і паўправаднікоў, біяфізіцы. Сканструяваў звышправодны тунэльны дыёд (1960), выявіў нестацыянарны эфект Джозефсана. Нобелеўская прэмія 1973 (разам з Б.*Джозефсанам* і Л.*Эсакі*).

ДЖАЗ (англ. jazz), род прафесійнай музыкі 20 ст., які спалучае рысы імправізацыйнасці ансамблевага дыялагічна-спаборніцкага музіцыравання і індывідуальна-кампазітарскага пачатку. Узнік на Пд ЗША на мяжы 19—20 ст. у выніку сінтэзу розных формаў муз. фальклору амер. неграў (паходзіць ад стараж. зах.-афр. традыцый — абрадавых песень і танцаў, *спірычуэл*, *блюза*, *рэгтайма*) з элементамі еўрап. музыкі.

Слова «джаз» з канца 1910-х г. абазначала музыку невял. ансамбляў, заснаваную на калектыўнай імправізацыі, стыль наз. новаарлеанскім, з 1920-х г. — чыкагскім, з 1940-х г. — *дыксіленд* (стваральнікі Дж.Олівер, Л.*Армстранг*, Дж.Р.Мортан, С.Бешэ). У пач. 1930-х г. усталяваўся стыль *свінг*, у канцы 1930-х г. — жанр камернага Дж., у пач. 1940-х г. — стыль *бібоп*, у 1950-я г. ў процівагу «гарачаму», нервоваму бібопу — стыль *кул-джаз*. Новыя школы імправіз. Дж. адлюстраваны ў практыцы *біг-бэндаў*, якія ўскладнілі вобразы і інстр. строй музыкі, фактуру і гармонію; узмацнілася роля *аранжыроўкі*. На гэтай аснове ўзніклі стыль прагрэсіў (С.Кентан, Б.Рыберн) з масіўным, цяжкім гучаннем і т. зв. трэцяя плынь — сінтэз сучаснай музыкі і Дж. (Г.Шулер, Дж.Льюіс). З 1950-х г. пашыраны розныя джазавыя школы, кірункі, стылі: хард-боп (А.Блейкі, К.Браўн), *фры-джаз*, мадальны Дж. (М.*Дэйвіс*, Дж.Колтрэйн), *джаз-рок*, сімфаджаз (П.Уайтмен) і інш. У выніку ўзаемадзеяння Дж. з моднымі танц. рытмамі і фальклорам пашырыліся *рок-н-рол*, «баса-нова» (джаз-самба), «соул» (спалучэнне *рытм-энд-блюза* і духоўнай негрыянскай музыкі). Развіццё найноўшага Дж. — бесперапынныя эксперыменты ў галінах рытмікі і муз. мовы, заснаваныя на віртуознай тэхніцы выканання. З паяўленнем самабытных джазавых музыкантаў неамер. паходжання стварыліся нац. джазавыя школы. Вял. ўвага аддаецца распрацоўцы этнічных муз. культур (Я.Гарбарэк, Нарвегія). У 1990-я г. Дж. актыўна судакранаецца з новымі кірункамі папулярнай «чорнай» музыкі — рэпам, хіп-хопам і інш. Інтанацыйныя, рытмічныя элементы Дж. выкарыстоўвалі кампазітары А.Дворжак, К.Дэбюсі, М.Равель, П.Хіндэміт, Д.Міё, Дж.Гершвін, Л.Бернстайн, І.Стравінскі і інш. Асобныя элементы Дж. выкарыстоўвалі сав. эстр. аркестры (А.Цфасмана, Л.Уцёсава, А.Варламава, В.Кнушавіцкага, Б.Карамышава, М.Мінха, А.Лундстрэма, Р.Паўлса і інш.). З 1950-х г. у б. СССР пашыраюцца невял. ансамблі тыпу джаз-бэнд (часцей наз. дыксілендамі), якія прытрымліваюцца традыц. Дж. (найб. вядомы Ленінградскі дыксіленд). Некат. вак.-інстр. ансамблі з 1960-х г. карыстаюцца прыёмамі сучаснага Дж. для апрацоўкі фальклорнага матэрыялу.

Эстр. аркестры Белдзяржэстрады, у т.л. *Дзяржаўны джаз-аркестр БССР*, набліжаліся да Дж. ў асноўным складам інструментаў. Асобныя элементы Дж. выкарыстоўваў на пач. 1960-х г. канцэртна-эстр. аркестр Бел. радыё, вял. рэпертуар джазавых кампазіцый розных стыляў і ўласцівыя Дж. прыёмы выканальніцтва характарызавалі дзейнасць канцэртна-эстр. аркестра Мінскага дзярж. цырка. У 1990-я г. лідэр выканаўцаў Дж. на Беларусі — *Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь*, які наладзіў і правёў 3 джаз-фестывалі (апошні ў 1997). У галіне вакальнага Дж. працуе ансамбль «*Камерата*». Некат. бел. выканаўцы прадстаўлены на серыі аўдыякасет «Беларускі джаз» фірмы «Каўчэг». Джазавая музыка пашырана і ў маст. самадзейнасці (найб. вядомы дыксіленд «Рэнесанс», з 1977). У Мінску з 1978 працуе джаз-клуб, які аб'ядноўвае аматараў Дж.

Літ.: Конен В.Д. Пути американской музыки. 3 изд. М., 1977; Яе ж. Рождение джаза. М., 1984; Панасье Ю. История подлинного джаза с 1890 по 1960: Пер. с фр. Ставрополь, 1991; Кольер Дж.Л. Становление джаза: Пер. с англ. М., 1984; Сарджент У. Джаз: Генезис. Муз. язык. Эстетика: Пер. с англ. М., 1987; Советский джаз: Проблемы. События. Мастера. М., 1987.

Дз.А.Падбярэзскі.

ДЖАЗ-РОК (англ. jazz-rock), адзін з кірункаў *джаза*; стыль прафес. музыкі. Выкрышталізаваўся ў канцы 1960-х г. у выніку спалучэння некат. формаў сучаснага джаза і джазавых аранжыровак з элементамі рокавай рытмікі і інструментоўкі. З 1970-х г. у выніку запазычання ім элементаў экзатычных муз. культур і ўскладнення рытмікі і формы адбылося яго пераўтварэнне ў якасна новую разнавіднасць — ф'южн (ад англ. сумесь, сплаў). Найб. росквіту Дж.-р. дасягнуў у творчасці амер. груп «Чыкага», «Прагноз надвор'я», англ. «Калізей», музыкантаў М.*Дэйвіса*, О.*Коўлмена*, Дж.Мак-Лафліна, Дж.Дзюка, Ж.Л.Панці, Ч.Корыя, Х.Хэнкака і інш. Многія бел. музыканты ў той ці іншай ступені выкарыстоўваюць у сваёй творчасці элементы джаз-рока (групы Б.Бернштэйна, «Яблычная гарбата» і інш.).

Дз.А.Падбярэзскі.

ДЖАЙЛО́ЛА (Jailolo), востраў у Інданезіі; гл. *Хальмахера*.

ДЖАЙНІ́ЗМ, рэлігійна-філасофскае вучэнне, пашыранае ў Шры-Ланцы і

Да арт. **Джайнізм**. Храм у Калькуце. 1986.

Індыі. Узнікла ў Індыі каля 6 ст. да н.э. Заснавальнікам лічыцца Вардхамана, празваны Джынай (пераможцам). Джайны пакланяюцца сваім пазамфічным прарокам як божествам. Паводле вучэння Дж., не існуе адзінага багатворца, сусвет бясконцы і нікім не створаны, усе істоты маюць жыватворчы пачатак — душу. Вял. значэнне надаецца прынцыпу *ахімсы* — непрычыненню зла жывому. У чалавека вызначаюцца 2 сутнасці: матэрыяльная (цела) і духоўная (душа). Выратаванне і вечнай асалоды можа дасягнуць толькі той, хто верыць у ісціннасць вучэння, выконвае правілы, выпрацаваныя ў Дж., маўкліва скараецца лёсу. Існуюць 2 асн. кірункі Дж.: дыгамбары (адмаўляюцца ад усіх спакус жыцця) і шветамбары (прапаведуюць менш строгі падыход да жыцця).

ДЖАЙПУ́Р, горад на Пн Індыі. Адм. ц. штата Раджастхан. Засн. ў 1728. 1458,2 тыс. ж. (1991). Вузел чыгунак і аўтадарог. Гандл.-прамысл. цэнтр. Прам-сць: баваўняная, гарбарна-абутковая, харч., шкляная, керамічная, эл.-тэхнічная. Маст. промыслы (вытв-сць ювелірных вырабаў і тканін з залатым і сярэбраным аздабленнем, чаканка, разьбярства на слановай косці, мармуры і інш. камянях). Турызм. Ун-т. Цэнтр культуры народа раджастхані. Арх. помнікі 18 ст.: Хава-Махал («Палац Вятроў»), абсерваторыя Джантар-Мантар, палац Чандра-Махал (у ім маст. Музей махараджы Джайпура) і інш.

ДЖАКА́РТА (Jakarta, Djakarta), горад, сталіца Інданезіі, на паўн.-зах. беразе в-ва Ява, пры ўпадзенні р. Чылівунг у Яванскае мора. З прыгарадамі ўтварае асобную адм. адзінку — Вялікую Дж. з нас. 8228 тыс. чал. (1993). Вузел чыгунак і аўтадарог. На ПнУ да горада прымыкае марскі порт Танджунгпрыёк (уваходзіць у Вялікую Дж.), праз які праходзіць каля паловы знешняга гандлю краіны. Міжнар. аэрапорт. Найб. эканам. цэнтр краіны. Прам-сць: харч. (рысаачышчальныя, чае- і каваапрацоўчыя, мукамольныя, рыбаперапр., алейныя, маргарынавыя прадпрыемствы), гумучукавая і гумавая, гарбарна-абутковая, тэкст., швейная, металаапр., маш.-буд. (суднабудаванне, суднарамонт, машынабудаўнічныя з-ды, мех. майстэрні), шкляная, папяровая, паліграфічная. Разнастайная рамесніцкая вытв-сць. Цэнтр рыбалоўства і марскіх промыслаў. Замежны турызм. Ун-ты. Музеі. Нац. галерэя мастацтва. Мячэць «Істыкляль». Парк «Інданезія ў мініяцюры». Штогадовы міжнар. кірмаш. Арх. помнікі 17—19 ст. еўрап. (галандскага) і еўрап.-ўсходнеазіяцкага стыляў.

Засн. ў 16 ст. У пач. 17 ст. разбураны галандцамі, якія ў 1619 пабудавалі тут крэпасць Батавія, і 1621 аднайменны горад. З 1945 рэзідэнцыя ген.-губернатара і сталіца галандскай калоніі. З 1945 сталіца Рэспублікі Інданезія. У 1949 Батавія перайменавана ў Дж.

ДЖАК'ЯКА́РТА, Яг'якарта (Yogyakarta, Jogjakarta, Djokjakarta), горад у Інданезіі, у цэнтр. ч. в-ва Ява. Вылучаны ў самаст. адм.-тэр. адзінку. Засн. ў 1755. 412 тыс. ж. (1990). Прам-сць тытунёвая, цукр., гарбарна-абутковая. Цэнтр традыц. вытв-сці тканін батык, маст. вырабаў. Культ. цэнтр (ун-ты Мусульманскі, «Гаджа Мада»). Музей старой яванскай культуры. Прыродны парк. Паблізу будыйскае свяцілішча *Барабудур* і Прамбанан (паселішча з арх. культавымі комплексамі 8—9 ст.), якія ўключаны ЮНЕСКА ў спіс *Сусветнай спадчыны*. Турызм. У 1946—49 — часовая сталіца Інданезійскай Рэспублікі.

ДЖА́ЛА, калючая частка джалячага апарату самак перапончатакрылых насякомых; відазменены яйцаклад (страціў функцыю адкладкі яец і ператварыўся ў орган абароны і нападзення). У спакоі Дж. знаходзіцца ўнутры канцавога сегмента брушка, пры неабходнасці высоўваецца і ўтыкаецца ў цела ахвяры. У Дж. ёсць канал, па якім у ранку паступае ядавітая вадкасць са спец. залоз. Дж. пчалы вышчарбленае, часам застаецца ў ахвяры і пчала гіне. Дж. таксама ёсць у скарпіёнаў — іголка з унутр. пратокай ядавітай залозы. Дж. памылкова наз. язык змей.

Да арт. **Джакарта**. Мячэць у арыстакратычным раёне Кебаяран.

ДЖАЛАНДХА́Р, горад на ПнЗ Індыі, у міжрэччы рэк Біяс і Сатледж, у штаце Пенджаб. Каля 500 тыс. ж. (1994). Стараж. гандл.-трансп. пункт на шляхах з Сярэдняй і Зах. Азіі ў Індыю. Чыг. станцыя, вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: тэкст., гарбарна-абутковая, металаапрацоўчая. Вытв-сць спорттавараў, цацак. Маст. рамёствы.

ДЖАЛІ́ЛЬ (Джалілаў) Муса Мустафіевіч (15.2.1906, в. Мустафіна Арэнбургскай вобл., Расія — 25.8.1944), татарскі паэт. Герой Сав. Саюза (1956). Скончыў Маск. ун-т (1931). Друкаваўся з 1919. Аўтар зб-каў паэзіі «Мы ідзём» (1925), «Ліст з акопа» (на рус. мове 1944), паэмы «Пісьманосец» (1938, выд. 1940), шматлікіх вершаў, лібрэта опер («Залатавалосая», 1941, Дзярж. прэмія СССР 1948; «Ільдар», 1941), літ.-крытычных і публіцыстычных артыкулаў. З 1941 на фронце. Цяжка паранены, у 1942 трапіў у палон. Вершамі працягваў падпольнае змаганне ў турме, за што быў пакараны смерцю. Блакнот з вершамі, напісанымі ў турме (больш за 100), быў перададзены з канцлагера на волю і склаў т.зв. «Маабіцкі сшытак» (1942—44, Ленінская прэмія 1957). Вершы гэтага цыкла прасякнуты верай у непераможнасць народа ў змаганні з фашызмам. На бел. мову творы Дж. пераклалі Э.Агняцвет, М.Аўрамчык, М.Гамолка, С.Гаўрусёў, Л.Дайнека, А.Пысін, Я.Семяжон і інш.

Тв.: Бел. пер. — Маабіцкі сшытак: Вершы. Мн., 1975; Я гляджу на зоры. Мн., 1985.

Літ.: Воздвиженский В.Г. «Моабитские тетради» Мусы Джалиля. М., 1969; Мустафин Р.А. По следам поэта-героя. М., 1971.

ДЖАЛІ́ЦІ (Giolitti) Джавані (27.10.1842, г. Мандаві, Італія — 17.7.1928), італьянскі дзярж. дзеяч. У 1889—90 міністр казначэйства, у 1901—03 міністр унутр. спраў. Прэм'ер-міністр у 1892—95, 1903—05, 1906—09, 1911—14, 1920—21. Найб. паслядоўны прадстаўнік італьян. лібералізму 20 ст., імкнуўся пашырыць сац. базу рэжыму. Урад Дж. жорстка задушыў сял. рух на Пд Італіі, развязаў захопніцкую вайну з Турцыяй (1911—12). У час 1-й сусв. вайны выступаў супраць удзелу ў ёй Італіі на баку Антанты. Падтрымаў прыход да ўлады фашыстаў (1922), з 1924 у апазіцыі. У 1928 выступаў супраць скасавання фашыстамі парламенцкага рэжыму.

ДЖАМАЛУ́НГМА, Эверэст, Сагарматха, самая высокая вяршыня на Зямлі, у Вял. Гімалаях, на мяжы Непала і Кітая. Выш. 8848 м. Складзена з гнейсаў, крышт. вапнякоў і сланцаў. Мае форму піраміды са стромкімі схіламі. Ледавікі. Упершыню дасягнута 29.5.1953 шэрпам Н.Тэнцынгам і новазеландцам Э.Хілары, сярод жанчын — японкай Ю.Табей (1976). Часткова ўваходзіць у склад нац. парку Сагарматха (Непал).

ДЖАМА́НАВА Роза Умбетаўна (н. 16.4.1928, г. Акцюбінск, Казахстан), казахская спявачка (сапрана). Нар. арт. СССР (1959). Скончыла Алма-Аціньскую кансерваторыю (1954), з 1977 выкладае ў ёй (праф. з 1987). У 1962—78 старшыня Казахскага тэатр. т-ва. З 1953 салістка Казах. т-ра оперы і балета.

Джамалунгма (Эверэст). З карціны М.К.Рэрыха.

Сярод партый у нац. операх — Кыз Жыбек («Кыз Жыбек» Я.Брусілоўскага), Сара («Біржан і Сара» М.Тулебаева), Ажар («Абай» А.Жубанава і Л.Хамідзі), у класічных — Тацяна, Іаланта («Яўген Анегін», «Іаланта» П.Чайкоўскага), Чыо-Чыо-сан, Мімі («Чыо-Чыо-сан», «Багема» Дж. Пучыні), Маргарыта («Фауст» Ш.Гуно), Амелія («Баль-маскарад» Дж.Вердзі). Дзярж. прэмія Казахстана 1972.

ДЖАМБАЛО́НЬЯ (Giambologna), Джавані Балонья (Giovanni Bologna; сапр. Жан дэ Булонь; Jean de Boulogne; 1529, г. Дуэ, Францыя — 13.8.1608), італьянскі скульптар, прадстаўнік *маньерызму*. У 1554 або 1555 прыехаў у Рым, дзе, верагодна, вучыўся ў *Мікеланджэла*. Працаваў у Фларэнцыі пры двары Медычы, а таксама ў Балоніі, Генуі. Выконваў багата дэкарыраваныя фантаны, скульпт. групы і статуі, статычныя конныя помнікі («Нептун», Балонія; «Козіма I Медычы», 1593, Фларэнцыя). Развіваючы ідэі Б.*Чэліні*, імкнуўся да стварэння «ідэальна круглай» скульптуры з уласцівай ёй прасторавай свабодай і магчымасцю ўсебаковага агляду (спіралепадобная па кампазіцыі група «Выкраданне сабінянак», 1583, Фларэнцыя), да арган. сувязі з прыродным асяроддзем («Алегорыя Апенін», Праталіна). Манерная вытанчанасць прапорцый і рухаў, дынамічнасць кампазіцыі, віртуозная дакладнасць апрацоўкі матэрыялу («Меркурый», 1564, Балонія, і 1580, Фларэнцыя) спалучаюцца ў Дж. з натуралістычнымі эфектамі (статуі птушак для грота вілы ў Кастэла, Фларэнцыя).

Джамбалонья. Меркурый. Бронза. 1580.

ДЖА́МБІ, другая назва р. *Хары* на в-ве Суматра ў Інданезіі.

ДЖАМБУ́Л, горад у Казахстане, цэнтр Джамбулскай вобл., на р. Талас. 312 тыс. ж. (1991). Чыг. вузел. Вядомы з 5 ст. як г. Тараз (Талас). У 10—12 ст. сталіца *Караханідаў дзяржавы*. З 1864 у складзе Расіі. Да 1936 наз. Аўлі-Ата, у 1936—38 — Мірзаян. Перайменаваны ў гонар *Джамбула Джабаева*. Прам-сць: хім., буд. матэрыялаў. ДРЭС. З ВНУ. Гісторыка-краязнаўчы музей, 2 тэатры. Маўзалеі Карахана (11 ст., перабудаваны ў 20 ст.) і Шамансур (13 ст.).

ДЖАМБУ́Л ДЖАБА́ЕЎ (28.2.1846, Сямірэчча, Казахстан — 22.6.1945), казахскі паэт-акын. Аўтар і выканаўца песень-жальбаў, песень-роздумаў, вершаваных прамоў, прывітальных пасланняў, гімнаў, паэм, тэматычна скіраваных на адлюстраванне нар. мар і спадзяванняў, імкненняў да лепшага жыцця («Доля бедняка», «Песня гнеўнага сэрца» і інш.), на асуджэнне сквапнасці, гультайства, крывадушнасці і інш. чалавечых заган. У ранні перыяд яго творчасці гал. месца займаў айтыс — паэтычная спрэчка акынаў. Больш позняя спадчына паэта — водгук на падзеі паліт., гасп. і культ. жыцця краіны. Паэзія вызначаецца псіхал. насычанасцю, эмацыянальнасцю, рэаліст. канкрэтнасцю вобразаў. Дзярж. прэмія СССР 1941. На бел. мову яго творы перакладалі П.Глебка, М.Танк, А.Жаўрук, А.Зарыцкі, А.Ушакоў.

Тв.: Бел. пер. — Песні і паэмы. Мн., 1939; Рус. пер. — Избр. произв. Алма-Ата, 1980.

ДЖАМІ́ Абдурахман Нураддзін ібн Ахмад (7.11.1414, с. Джам, каля г. Нішапур, Іран — 9.11.1492), персідскі і таджыкскі пісьменнік і вучоны. Настаўнік і сябар Алішэра *Наваі*. Вучыўся ў Самаркандзе і Герацэ, дзе пражыў усё жыццё. Кананізаваны. Завяршыў перыяд развіцця паэзіі ўсх. краін на мове фарсі. Майстар віртуозны паэт. формы. Выступаў у шматлікіх паэт. жанрах (газель, рубаі, касыды, месняві і інш.). Раннія творы Дж. — празаічныя суфійскія і свецкія трактаты, дапаможнік па складанні рэбусаў, шарад. Аўтар прац па філасофіі, тэалогіі, л-ры, гісторыі, рыторыцы, музыцы, цыкла з 7 паэм (семярыца) «Сем карон», або «Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы» (1480—87), зб-каў газелей «Пачатак юнацтва» (1479), «Сярэдзіна жыццёвай ніці» (1479), «Завяршэнне жыцця» (1491), зб. прытчаў «Бахірыстан» (1487) і інш. Ад ідэй рэліг. нецярпімасці і абскурантызму Дж. ўзняўся да пратэсту супраць дэспатызму і сац. несправядлівасці, ад містычнай абмежаванасці да філас. абагульненняў і пропаведзі гуманіст. ідэй.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. Л., 1978.
Літ.: Бертельс Е.Э. Навои и Джами. М., 1965.

ДЖА́МНА, Ямуна, рака ў Індыі, правы, самы доўгі прыток р. Ганг. Даўж. 1384 км, пл. бас. 351 тыс. км^2. Пачынаецца ў ледавіках хр. Заскар у Гімалаях, у вярхоўі цячэ па вузкай глыбокай цясніне, у сярэднім і ніжнім цячэнні — на Інда-Гангскай раўніне. Буйны прыток Чамбал. Сярэдні расход вады каля 2,5 тыс. м^3/с. Летняя паводкі ад мусонных дажджоў. Ад Дж. адыходзяць шматлікія арашальныя каналы. На Дж. — гарады Дэлі (пачатак суднаходства), Агра, Алахабад.

ДЖАМНА́ГАР, горад на З Індыі, на п-ве Катхіявар, у штаце Гуджарат. Каля 400 тыс. ж. (1994). Порт у зал. Кач. Чыг. станцыя, вузел аўтадарог. Прам-сць: тэкст., харч., гарбарна-абутковая, хім., цэментная. Рамесніцкае фарбаванне тканін. Ун-т.

ДЖА́МУ І КАШМІ́Р, штат на Пн Індыі. Пл. 222,2 тыс. км. Нас. 7718,7 тыс. чал. (1991, на тэр., падкантрольнай Індыі), пераважна кашмірцы. Адм. ц. Срынагар (летам), Джаму (зімой). Тэр. занята хрыбтамі Зах. Гімалаяў (на Пд) і Каракарума (на Пн) з вяршынямі да 7—8 тыс. м і ледавікамі. Горны субтрапічны клімат, сухі з марознымі зімамі на ПнУ, мусонны і цёплы на ПдЗ. Значныя рэкі — Інд і яго прытокі Гілгіт, Джэлам. Найб. асвоена Кашмірская даліна. Пераважае сельская гаспадарка. Пад пасевамі 20% тэр. Гал. культуры: ячмень, рыс, шафран, пшаніца. Горная пашавая жывёлагадоўля (пераважна авечкі і козы). Агародніцтва і садоўніцтва (грэцкі арэх, міндаль, яблыкі, грушы, персікі і інш.). Лесанарыхтоўкі і дрэваапр. прам-сць. Рамесніцкая вытв-сць дываноў, пуховых хустак, вышывак, ювелірных вырабаў. Шоўкаматальныя і шарсцяныя ф-кі. Міжнар. турызм і альпінізм.

У 1947 у выніку падзелу Брыт. Індыі на дзяржавы Індыя і Пакістан княства Дж. і К. з пераважна мусульм. насельніцтвам (75%) аднесена да тэр. Індыі. Прэтэнзіі пакістанскіх улад на тэр. Дж. і К. выклікалі 3 узбр. канфлікты паміж Пакістанам і Індыяй (1947—49, 1965, 1971). Унутры Дж. і К. на працягу апошніх 50 гадоў адбываюцца ўзбр. сутыкненні паміж прыхільнікамі ўтварэння тут незалежнай дзяржавы і інд. вайск. фарміраваннямі і сіламі бяспекі. Пасля абвастрэння становішча ў штаце ў канцы 1980-х г. кіраўніцтва Індыі ўвяло тут 19.1.1990 прэзідэнцкае праўленне. *У.Я.Калаткоў* (гісторыя).

ДЖАМШЭДПУ́Р, Татанагар, горад на У Індыі, на пласкагор'і Чхота-Нагпур, у штаце Біхар. Засн. ў 1907 як металургічны цэнтр (на базе мясц. жалезарудных і кам.-вуг. радовішчаў). Каля 800 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Буйны цэнтр цяжкай прам-сці. Сельскагасп., трансп., энергет., тэкст. машынабудаванне, вытв-сць экскаватараў, абсталявання для папяровай прам-сці, разнастайных хім. прадуктаў.

ДЖА́НАТА ПА́РТЫ (Нар. партыя), палітычная партыя ў Індыі ў 1977—80. Створана ў выніку аб'яднання партый Інд. нац. кангрэс (ІНК), Бхаратыя джан сангх, Бхаратыя лок дал, Сацыялісг. партыі і Кангрэса за дэмакратыю з мэтай забеспячэння перамогі ІНК на выбарах 1977. Імкнулася згуртаваць самыя розныя паліт. плыні. У 1977—79 правячая партыя. Лідэры: М.Дэсаі, Ш.Сінгх, Дж.Рам.

ДЖАНБА́С-КАЛА́, Джанбаскала, руіны крэпасці (4 ст. да н.э. — 1 ст. н. э.) у пустыні Кызылкум (Узбекістан). Абарончыя сцены ўтваралі прамавугольнік памерам 200 м × 170 м, заняты жылымі пабудовамі, падзеленымі на 2 кварталы. У 1939 праведзены раскопкі, расчышчаны жылыя памяшканні і рэшткі абшчыннага свяцілішча агню. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй.

«ДЖАНГА́Р», калмыцкі шматварыянтны гераічны эпас, створаны ў 15 ст. Часткова (урыўкі) упершыню апублікаваны ў 1804—05. Поўны запіс 10 песень «Дж.» зроблены ў 1910. Выдаваўся ў 1922, 1935, 1936, 1940. Асн. змест твора — услаўленне казачнай краіны Бумба і легендарных подзвігаў хана Джангара і 12 волатаў — змагароў за нац. незалежнасць калм. народа, носьбітаў яго найлепшых якасцей, адвечных спадзяванняў. Паасобныя раздзелы на бел. мову пераклалі Э.Агняцвет, М.Клімковіч.

Публ.: Рус. пер. — Джангар: Калмыцкий нар. эпос. М., 1958.

ДЖАНГІТА́У, Джанга, горная вяршыня ў цэнтр. ч. Вял. Каўказа, на мяжы Кабардзіна-Балкарыі і Грузіі. Выш. 5058 м. Складзена з гранітаў. У раёне Дж. бярэ пачатак адзін з самых буйных ледавікоў Каўказа — Безенгі.

ДЖАНІБЕ́К (? — 1357), хан *Залатой Арды* ў 1342—57, сын і пераемнік хана *Узбека*. Завалодаў прастолам, забіўшы двух сваіх братоў. У час яго праўлення Арда дасягнула найб. ваен. ўздыму. Актыўна ўмешваўся ва ўнутр. справы рус. княстваў. Для ўмацавання сваёй улады ў Ардзе насаджаў іслам. У 1356 здзейсніў паход у Азербайджан, захапіў Тэбрыз і пасадзіў там свайго намесніка. У выніку паўстання ў Тэбрызе да ўлады прыйшлі Джалаіры, галіны Чынгісідаў, варожай да Дж. Загінуў, калі вяртаўся ў Арду.

ДЖАНІБЕ́КАЎ Уладзімір Аляксандравіч (н. 13.5.1942, с. Іскандар Ташкенцкай вобл., Узбекістан), савецкі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1978, 1981). Лётчык-касманаўт СССР (1978), ген.-маёр авіяцыі (1985). Скончыў Ейскае вышэйшае авіяц. вучылішча лётчыкаў (1965). З 1970 у атрадзе касманаўтаў. 10—16.1.1978 з А.Р.*Макаравым* здзейсніў палёт на касм. караблі (КК) «Саюз-27» (як камандзір) і на арбітальную станцыю (АС) «Салют-6» з прыстыкаваным да яе КК «Саюз-26» (экіпаж Ю.В.*Раманенка*, Г.М.*Грэчка*), 22—30.3.1981 з Ж.*Гурагчам* — палёт на КК «Саюз-32» (як камандзір) і на АС «Салют-6» (асн. экіпаж У.В.*Кавалёнак*, В.П.*Савіных*), 24.6.—2.7.1982 з А.С.*Іванчэнкавым* і Ж.Л.*Крэцьенам* — палёт на КК «Саюз Т-6» (як камандзір) і на АС «Салют-7» (асн. экіпаж А.М.*Бераэавой*, В.В.*Лебедзеў*), 17—29.7.1984 з С.Я.*Савіцкай* і І.П.*Воўкам* — палёт на КК «Саюз Т-12» (як камандзір) і на АС «Салют-7» (асн. экіпаж Л.Дз.*Кізім*, У.А.*Салаўёў*, А.Ю.Ацькоў), ажыццявіў выхад у касм. прастору, 6.6—26.9.1985 з Савіных — палёт на КК «Саюз Т-13» і на АС «Салют-7». Правёў у космасе 148,67 сут.

Джамбул Джабаеў.

У.А.Джанібекаў.

ДЖАНСУГУ́РАЎ Ільяс (1.5.1894, г.п. Джансугураў, Казахстан — 1937), казахскі паэт. Вучыўся ў Маск. камуніст. ін-це журналістыкі (1925—28). Рэпрэсіраваны, у 1958 рэабілітаваны. Друкаваўся з 1915. Гіст. мінулае, перамены ў жыцці, побыце, псіхалогіі і свядомасці казахаў — у паэмах «Стэп» (1930), «Кулагер» (1936), рамане «Таварышы» (1933), зб. сатыр. твораў «Права» (1935), п'есах «Турксіб», «Нянавісць», «Ісатай-Махамбет» (усе 1936) і інш. Тонкі гумар, паглыблены лірызм, уменне адлюстроўваць найб. характэрныя сац. з'явы — адметныя асаблівасці яго таленту. Адзін з першых перакладчыкаў на каз. мову твораў Я.Купалы. На бел. мову асобныя творы Дж. пераклаў У.Шахавец.

Літ.: Каратаев М. И. Джансугуров. Алма-Ата, 1965. *Ж.Сахіеў.*

У.Джапарыдзе. «Думкі маці». 1945.

ДЖАПАРЫ́ДЗЕ Уча Малакіевіч (17.8.1906, с. Гары Анскага р-на, Грузія — 1988), грузінскі жывапісец і графік. Праф. (1944). Нар. мастак СССР (1963). Правадз. чл. АМ СССР (1958). Вучыўся ў Нар. маст. студыі М.*Таідзе* (1922—24) і Тбіліскай АМ (1924—25, 1928—31). Аўтар маст. палотнаў гіст. тэматыкі «Першамайская дэманстрацыя ў Тыфлісе ў 1901 годзе» (1939—41, Дзярж. прэмія СССР 1942), жанравых карцін «Сябры юнацтва» (1938), «Думкі маці» (1945), «Свята працы» (1970—75), партрэтаў У.Чхеідзе, Д.Гурамішвілі, Т.Шаўчэнкі і інш. Вядомы як ілюстратар.

Джарджоне. Юдзіф. Пач. 16 ст.

ДЖАРДЖО́НЕ [Giorgione; сапр. Барбарэлі да Кастэльфранка

(Barbarelli da Castelfranco) Джорджа; 1476 або 1477, г. Кастэльфранка-Венета, Італія — вер. або кастр. 1510], італьянскі жывапісец *венецыянскай школы жывапісу*, адзін з пачынальнікаў мастацтва Высокага *Адраджэння*. Вучыўся, верагодна, у Дж.*Беліні*, быў блізкі да венецыянскіх гуманістаў, вядомы таксама як спявак і музыкант. Побач з кампазіцыямі на рэліг. тэмы («Пакланенне пастухоў», каля 1504) пісаў карціны на свецкія, у асн. міфал., сюжэты, якія ў яго творчасці сталі пераважнымі. У творах «Юдзіф» (каля 1502), «Тры філосафы», «Навальніца» (абедзве 1506—07), «Спячая Венера» (1507—08) паэт. ўяўленні мастака пра багацце скрытых у свеце і чалавеку жыццёвых сіл раскрываюцца не ў дзеянні, а ў перадачы стану агульнай маўклівай адухоўленасці. Захоўваючы ўласцівыя мастацтву Ранняга Адраджэння яснасць аб'ёмаў і меладычную выразнасць контураў, ён з дапамогай празрыстага святлаценю дасягаў зрокавага зліцця чалавечых фігур з пейзажам. Выкананыя ім партрэты вызначылі інтымна-лірычную танальнасць (партрэт юнака, 1502, жаночы партрэт, т. зв. «Лаура», 1506). Творчая канцэпцыя Дж. зрабіла значны ўплыў на венецыянскі жывапіс і атрымала развіццё ў яго вучня *Тыцыяна*.

ДЖА́РМА, шматпластавое паселішча эпохі неаліту (каля 6,5—5 тыс. г. да н.э.) у Паўн. Іраку. Выяўлены глінабітныя прамавугольныя жытлы, часам на каменных падмурках. Асн. заняткі насельніцтва — земляробства (пшаніца, ячмень) і жывёлагадоўля (козы). Знойдзены каменныя прылады працы, гліняныя статуэткі жывёлін і жанчын, керамічны посуд толькі ў верхніх культ. пластах. Дж. — адзін з найб. стараж. у свеце помнікаў вытворнай гаспадаркі.

А.В.Іоў.

ДЖА́ТЫ, вялікая група плямён, якія ў пач. н. э. насялялі зах. раёны Пенджаба, пазней склалі этн. аснову пенджабцаў і ўвайшлі ў абшчыну *сікхаў*. У Індыі значная частка Дж. ператварылася ў земляробчую касту. У 17—18 ст. адбыліся паўстанні Дж. (1669, 1672, 1686—91) супраць *Вялікіх Маголаў*. У сярэдзіне 18 ст. склалася самаст. джацкае княства, якое ў 1763 распалася. Сучасныя Дж. жывуць на Пн Індыі і ў Пакістане.

ДЖА́ФНА, горад у Шры-Ланцы. 129 тыс. ж. (1993). Порт на п-ве Джафна. Праз Дж. праходзяць асн. марскія сувязі з Індыяй і Бірмай. Перапрацоўка с.-г. сыравіны. Ун-т. Рэшткі галандскіх фартыфікацыйных збудаванняў 17 ст. Марскія пляжы.

ДЖАХАНГІ́Р Салім (1569, г. Агра, Індыя — 1627), правіцель *Магольскай імперыі* [1605—27]. З дынастыі *Вялікіх Маголаў*, сын *Акбара*. Пры ім адменены рэформы Акбара, узмацнілася ўлада феадалаў-джагірдараў (гл. *Джагір*). У 1613 дазволіў англ. Ост-Індскай кампаніі заснаваць гандл. факторыю ў г. Сурат. Пашырыў межы дзяржавы на Пн Індыі. Знаўца мастацтва і л-ры, меценат архітэктуры і мініяцюрнага жывапісу. Аўтар успамінаў.

ДЖА́Я (Jaya, Djaja; да 1965 Карстэнс, да 1969 Сукарна), горная вяршыня ў Інданезіі, на З в-ва Новая Гвінея, у гарах Маоке. Выш. 5029 м (самая высокая ў Акіяніі). Складзена з крышт. парод. З выш. 4400 м — вечныя снягі і ледавікі (агульная пл. каля 15 км²). Уваходзіць у склад нац. рэзервата Лорэнц.

ДЖВА́РЫ, храм на вяршыні гары, каля сутокаў Куры і Арагві, непадалёку ад г. Мцхета (Грузія); помнік сярэдневяковай груз. архітэктуры. Пабудаваны ў 586/587—604. Вызначаецца гарманічнасцю прапорцый. У аснове плана цэнтрычнага тыпу храма — крыж (22 м × 18 м), канцы якога завершаны паўкруглымі апсідамі. Цэнтр. прастора перакрыта купалам на 8-гранным барабане. Усх. і паўд. фасады ўпрыгожаны фігурнымі рэльефамі і разьбой. Да храма прымыкае крыжападобная малая царква (6 ст., захавалася ў руінах).

Храм **Джвары**. Усходні фасад.

ДЖГІР БАЛО́НА, ёрш Балона (Gymnocephalus baloni), рыба сям. акунёвых атр. акунепадобных. Выяўлены ў 1970 у сярэднім і ніжнім цячэнні р. Дунай і некат. яго прытоках. На Беларусі ёсць у р. Прыпяць ніжэй г. Пінск (1984).

Даўж. да 13 см, маса да 41 г. Цела кароткае, высокае. Афарбоўка жаўтавата-карычневая. На нізе галавы, шчэлепных накрыўках і брушку дробныя карычневыя плямкі. На баках цела 4—6 цёмных папярочных палос. На спінным, хваставым і анальных плаўніках цёмныя плямы. Галава кароткая, тупая, крута пераходзіць у цела. У большых асобін ёсць характэрны горб.

Т.М.Шаўцова.

ДЖГІРЫ́, ярш ы (Gymnocephalus), род рыб сям. акунёвых. 4 віды: Дж., або ёрш звычайны (G. cernua); Дж., або ёрш-насар, або біручок (G. acerina); Дж., або ёрш паласаты (G. schraetser); Дж., або ёрш Балона (G. baloni). Пашыраны ў вадаёмах Еўразіі, акрамя Крайняй Поўначы, Каўказа, Крыма, Сярэдняй Азіі і бас. Ціхага ак. На Беларусі 3 віды: звычайны (мясц. назва ёрш, аджур, яжгур) жыве ў рэках, азёрах і інш. вадаёмах, насар (мясц. назвы біручок, бабыр, ваўчок, чыранос) трапляецца ў Дняпры, Балона знойдзены ў Прыпяці.

Даўж. да 30 см, маса да 200 г (зрэдку да 600 г). Цела сціснутае з бакоў. На галаве вял. поласці сенсорных каналаў. Рот невялікі, высоўны, паўніжні. Пераднакрыўка з некалькімі шыпамі. На накрыўцы моцны шып. Спінны плаўнік адзін, калючая частка зліта з разгалінаванай. Кормяцца беспазваночнымі, ікрой і маляўкамі рыб. Аб'екты лоўлі. *Л.В.Кірыленка.*

ДЖО́БЕР (англ. jobber), 1) гістарычна — прадпрымальнік, які даваў напракат коней з экіпажамі. 2) Біржавы *маклер*, камісіянер (першапачаткова член Лонданскай фондавай біржы), які ажыццяўляе аперацыі за ўласны кошт (пры нефіксаваным даходзе), уступае ў

Джгіры: 1 — насар; 2 — звычайны; 3 — Балона; 4 — паласаты.

здзелкі з *брокерамі* і інш. дзелавымі людзьмі.

ДЖО́ЗЕФСАН (Josephson) Браян Дэйвід (н. 4.1.1940, г. Кардыф, Вялікабрытанія), англійскі фізік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1970). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1960), дзе і працуе (з 1974 праф.). Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела і звышправаднікоў. Прадказаў (1960) праходжанне звышправоднага току праз тонкі слой дыэлектрыка, які раздзяляе 2 звышправаднікі (гл.

Б.Джозефсан.

Джозефсана эфект). Нобелеўская прэмія 1973 (разам з А.*Джаеверам* і Л.*Эсакі*).

ДЖО́ЗЕФСАНА ЭФЕ́КТ, працяканне звышправоднага току праз тонкі слой дыэлектрыка, які раздзяляе 2 звышправаднікі (кантакт Джозефсана). Прадказаны Б.*Джозефсанам* (1962); эксперыментальна выяўлены амер. фізікамі П.Андэрсанам і Дж.Роўзлам у 1963 пры вывучэнні вольт-амперных характарыстык джозефсанаўскіх кантактаў.

Уласцівасці Дж.э.: электроны праводнасці праходзяць праз дыэлектрык з-за *тунэльнага эфекту* і, калі ток праз кантакт меншы за пэўнае значэнне, падзенне напружання на кантакце няма (с т а ц ы я н а р н ы Дж.э.), а калі перавышае — узнікае падзенне напружання і кантакт выпрамяняе эл.-магн. хвалі (н е с т а ц ы я н а р н ы Дж.э.). На аснове Дж.э. распрацаваны звышправодныя інтэрферометры, маламагутныя генератары, хуткадзейныя элементы ЭВМ, параметрычныя пераўтваральнікі, адчувальныя дэтэктары, узмацняльнікі і інш.

ДЖО́ЙС (Joyce) Джэймс Аўгусцін Алоіс (2.2.1882, Дублін — 13.1.1941), ірландскі пісьменнік. Выхоўваўся ў езуіцкіх школах, скончыў Дублінскі ун-т (1902). У 1904 пакінуў Ірландыю, жыў у Трыесце, Цюрыху, Парыжы. Аўтар кн. вершаў «Камерная музыка» (1907), зб. апавяданняў «Дублінцы» (1914), рамана «Партрэт мастака ў юнацтве» (1916), п'ес «Бліскучая кар'ера» (1900), «Выгнаннікі» (1915, апубл. 1918), шматлікіх эсэ і артыкулаў. Сенсацыйны поспех яму прынеслі раманы «Уліс» (1922) і «Памінкі па Фінегану» (1939), што аказалі вызначальны ўплыў на сусв. л-ру 20 ст. У аснове маст. сістэмы рамана «Уліс» «плынь свядомасці», якая паступова з маст. прыёму перарастае ў жанр. Характэрныя рысы твора — парадаксальнасць і суб'ектыўнасць, асацыятыўнасць, часава-прасторавыя напластаванні, звышнасычанасць шматзначнымі сімваламі, рознага роду словатворчасць. Вял. ролю адыгрываюць аналогіі з гамераўскай «Адысеяй» (у кампазіцыі, у парадыйным узнаўленні эпізодаў эпасу, у паралелях паміж міфалагічнымі героямі і персанажамі Дж.). Раман стаў бясспрэчным узорам л-ры постмадэрнізму. Яшчэ ў большай ступені стылявы поліфанізм характэрны для рамана «Памінкі па Фінегану», у якім адсутнічае канкрэтны час, а падзеі адбываюцца ў сне. На бел. мову раман «Уліс» пераклаў Я.Максімюк (1-я частка — 13 «эпізодаў» з 18 — выдадзена ў 1993 у Беластоку, Польшча); асобныя апавяданні пераклаў І.Бабкоў.

Тв.: Рус. пер. — Дублинцы. Портрет художника в юности. Улисс. Т. 1—3. М., 1993—94; У кн.: Поэзия Ирландии. М., 1988.

Літ.: Жантиева Д.Г. Джеймс Джойс. М., 1967. *Е.А.Лявонава.*

ДЖО́ЛІ (Joly) Джон (1.11.1857, графства Офалі, Ірландыя — 8.12.1933), англійскі геолаг і геафізік. Скончыў Трыніты-каледж у г. Дублін. З 1897 праф. у Дублінскім ун-це. Першым звярнуў



Да арт. **Джозефсана эфект**: *а* — тунэляванне звышправодных пар; *б* — элемент Джозефсана; 1 — электронная пара; 2 — звышправаднік; 3 — дыэлектрык (слой вокіслу); 4 — падложка.

увагу на значэнне радыеактыўных элементаў для цеплавога рэжыму Зямлі. Па колькасных вызначэннях наяўнасці радыеактыўных элементаў у розных горных пародах падлічыў колькасць энергіі, якая вылучаецца ў працэсе радыеактыўнага распаду. Атрыманыя звесткі выкарыстаў для пабудовы геатэктанічнай гіпотэзы, якой спрабаваў растлумачыць перыядычнасць тэктанічных працэсаў.

ДЖОН (John) Агастэс Эдвін (4.1.1878, г. Тэнбі, Вялікабрытанія — 31.10.1961), англійскі жывапісец і графік. Вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў Слэйда ў Лондане (1894—98). З 1903 член «Новага англійскага мастацкага клуба». Прэзідэнт Каралеўскага т-ва жывапісцаў-партрэтыстаў (1948—53). Буйны майстар рэаліст. партрэта (Б.Шоу, каля 1913—14; Т.Гардзі, 1923, і інш.), аўтар жанравых карцін («Жанчына, якая ўсміхаецца», 1910; «Жабракі», каля 1912—14, і інш.), а таксама дэкар. кампазіцый, афортаў і літагравюр. Творам Дж. ўласцівы глыбокая характарнасць і псіхал. насычанасць вобразаў, упэўненая тэмпераментная манера пісьма.

ДЖО́НКА (малайскае djong, скажонае кіт. чуань судна), грузавое драўлянае ветразевае судна з шырокімі і высока прыўзнятымі кармой і носам. Мае 2—4 мачты. Ветразі чатырохвугольнай формы з цыновак і бамбукавых рэек. Асадка невялікая, грузападымальнасць да 600 т. На Дж. перавозяць грузы, выкарыстоўваюць як жыллё. Распаўсюджаны ў Паўд.-Усх. Азіі.

ДЖОНС (Jones) Джон Пол (6.7.1747, Кіркбін, каля г. Дамфрыс, Вялікабрытанія — 18.7.1792), ваенна-марскі дзеяч, нац. герой ЗША. Каля 1773 перасяліўся ў амер. калоніі Вялікабрытаніі. У *вайну за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83* адзін з арганізатараў і кіраўнік флоту каланістаў, на чале невял. флатыліі здзейсніў нападзенне на англ. порт Уітхавен і спаліў яго (1778), на чале пашкоджанага фрэгата ўзяў на абардаж 44-пушачны брыт. фрэгат (22.9.1779). Па запрашэнні Кацярыны II у 1788—89 служыў у рас. ВМФ, контр-адмірал. У рус.-тур. вайну 1787—91 на чале парусной эскадры Дняпроўскага лімана ва



Джонка.

ўзаемадзеянні з вёславай флатыліяй К.Насаў-Зігена і войскамі А.В.Суворава ў чэрв. 1788 разбіў тур. флот каля Ачакава. Памёр у Парыжы. Прах Дж. ў 1905 перавезены ў ЗША.

ДЖОНС (Jones) Джэймс (6.11.1921, г. Робінсан, штат Ілінойс, ЗША — 9.5.1977), амерыканскі пісьменнік. Удзельнічаў у 2-й сусв. вайне, быў цяжка паранены. Вядомасць прынёс антымілітарысцкі раман «З гэтага часу і навек» (1951). Аўтар раманаў «Тонкая чырвоная рыса» (1962), «Вясёлы месяц май» (1971), «Толькі пакліч» (1978) і інш., а таксама кніг нарысаў «В'етнамскі дзённік» (1974), мемуараў «Другая сусветная вайна» (1975), аповесцей, рэпартажаў, кінасцэнарыяў. Распрацоўваючы канкрэтна-гіст. тэмы 2-й сусв. вайны, «вял. дэпрэсіі» ў Амерыцы 1930-х г., разважаў над вечнымі праблемамі: чалавек і вайна, жыццё і смерць, любоў і нянавісць, свабода і абавязак. Значнае месца ў рэаліст. прозе займае элемент натуралізму, абумоўлены маст. задачамі.

І.Джонс. Банкетная зала палаца Уайтхал у Лондане. 1619—22.

Тв.: Рус. пер. — Отныне и вовек. М., 1986.

Літ.: Олдридж Дж. Джеймс Джонс: простодушный в Париже // Олдридж Дж. После потерянного поколения: Сб. ст.: Пер. с англ. М., 1981. *Е.А.Лявонава.*

ДЖОНС (Jones) Ініга (15.7.1573, Лондан — 21.6.1652), англійскі архітэктар. Неаднаразова наведваў Італію, дзе вывучаў работы А.*Паладыо* (да яго трактата «Чатыры кнігі пра архітэктуру» выдаў каментарыі ў 1715) і Дж.*Віньёлы*. У 1615—43 гал. дазорац каралеўскіх будынкаў. Як адзін з буйнейшых прадстаўнікоў англ. *паладыянства* сцвярджаў у айч. архітэктуры прынцыпы класічнага дойлідства. Яго праект палаца Уайтхал у Лондане (1619—22; пабудавана Банкетная зала), віла каралевы («Куінсхаўс») у Грынвічы (1616—35) адметныя выразнасцю кампазіцыі і высакароднай прастатой формаў.

ДЖО́НСАН (Jonson) Бенджамін (Бен; 11.6.1573, Лондан — 6.8.1637), англійскі драматург, паэт, тэарэтык драмы. Вучыўся ў Вестмінстэрскай школе. Першая камедыя «Абставіны змяніліся» (1597). У пралогах п'ес аспрэчваў творчыя прынцыпы сучаснікаў, у т.л. свайго сябра У.Шэкспіра, адстойваў адналінейнае адлюстраванне характараў. Паводле сваёй «тэорыі гумараў», у камедыях «Усякі ў сваім нораве» (1598) і «Усякі не ў сваім нораве» (1599) тлумачыў «гумар» як індывідуальнае дзівацтва, а ў камедыях нораваў «Вальпоне, або Ліса» (1605), «Эпісін, або Маўклівая жанчына» (1609), «Алхімік» (1610) і «Варфаламееўскі кірмаш» (1614) — як сацыяльнатыповыя заганы арыстакратыі і буржуазіі. Аўтар трагедый «Падзенне Сеяна» (1603) і «Змова Катыліны» (1611), 30 «масак» — п'ес-алегорый на міфалагічныя сюжэты, зб-каў вершаў «Эпіграмы» і «Лес» (абодва 1616).

ДЖО́НСАН (Johnson) Ліндан Бейнс (27.8.1908, каля г. Стонуал, штат Тэхас, ЗША — 22.1.1973), палітычны і дзярж. дзеяч ЗША. Чл. Дэмакр. партыі. Дэп. палаты прадстаўнікоў (1937—48), сенатар ад штата Тэхас (1949—60) і лідэр дэмакратаў (1953—60) у сенаце кангрэса ЗША. Віцэ-прэзідэнт (1961—63), пасля забойства Дж.Ф.*Кенэдзі* прэзідэнт ЗША (1963—69). Прэзідэнцтва Дж. адзначана ўцягваннем ЗША ў вайну ў В'етнаме (з 1964—65), інтэрвенцыяй у Дамініканскую Рэспубліку (1965), абвастрэннем адносін з Францыяй, падтрымкай Ізраіля ў араба-ізраільскую (Шасцідзённую) вайну 1967, унутр. расавымі і сац. хваляваннямі, спробамі сац. рэформаў. Напярэдадні адстаўкі пачаў працэс мірнага ўрэгулявання в'етн. праблемы, садзейнічаў паляпшэнню адносін з СССР (*Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі*).

ДЖО́НСАН (Johnson) Філіп (н. 8.7.1906, г. Кліўленд, штат Агайо, ЗША), амерыканскі архітэктар. Вучыўся ў арх. школе Гарвардскага ун-та ў М.*Броера* (1940—50-я г.). Вучань і супрацоўнік Л.*Міс ван дэр Роэ*. Развіваючы яго прынцыпы, пабудаваў уласны дом у г. Нью-Канаан (штат Канектыкут, 1949) у выглядзе шклянога паралелепіпеда. У далейшым спалучаў прынцыпы і матэрыялы сучаснай архітэктуры са свабоднай стылізацыяй традыц. арх. формаў — класіцызму, готыкі, рэнесансу, а таксама Стараж. Рыма, сярэдневяковага Блізкага і Д. Усходу (Музей сучаснага мастацтва, 1930—36 і 1946—54, тэатр штата Нью-Йорк у «Лінкальн-цэнтры», 1964, абодва ў Нью-Йорку; купал ядзернага рэактара ў Ізраілі, 1960).

Літ.: Noble Ch. Ph. Johnson. London, 1972.

ДЖО́ПЛІН (Joplin) Джэніс (19.1.1943, г. Порт-Артур, штат Тэхас, ЗША — 4.10.1970), амерыканская рок-спявачка і кампазітар, аўтар тэкстаў; адна з першых вядомых белых спявачак *блюза*. З 1966 выступала і гастраліравала з некалькімі рок-групамі (у т.л. «Вялікі брат і кампанія»), стала кумірам руху хіпі. Валодала дасканалым ад прыроды моцным прыгожым голасам, тонкай нюансіроўкай. Яе рэпертуар уключаў блюзы, творы ў стылях «соўл» і «кантры» (у т.л. ўласныя). Вылучалася эмацыянальна-страснай манерай выканання (сярод прыёмаў — віск, хрып, шэпт, стогн), якая зрабіла вял. ўплыў на наступныя пакаленні рок-спевакоў. *Дз.А.Падбярэзскі.*

ДЖО́ПЛІН (Joplin) Скот (24.11.1868, г. Тэксаркана, ЗША — 1.4.1917), амерыканскі піяніст, кампазітар, джазавы спявак. Атрымаў вядомасць як аўтар і выканаўца фартэпіянных твораў (каля 50) у стылі *рэгтайм*, які паўплываў на стылістыку музыкі яго балета «Танцавальны рэг» (1902), оперы «Трыманіша» (1911), мюзікла «Калі» (1916) і інш. Сярод інш. твораў інстр. п'есы «Сцяг з кляновым лістом» (1899), «Канферансье», мелодыя якой — вядучая муз. тэма фільма «Афера» (1973) — адрадзіла цікавасць да яго творчасці. Аўтар падручніка «Школа рэгтайма».

ДЖО́РДЖ (George) Генры (2.9.1839, г. Філадэльфія, ЗША — 29.10.1897), амерыканскі эканаміст, публіцыст. Прапанаваў ідэю «адзінага зямельнага падатку» як сродку забеспячэння ўсеагульнага дастатку і сацыяльнага міру, якая па сутнасці азначала пакрыццё ўсіх дзярж. расходаў за кошт зямельнай рэнты.

Ф.Джонсан. Інтэр'ер тэатра штата Нью-Йорк у «Лінкальн-цэнтры» ў Нью-Йорку. 1964.

Даследаваў праблемы заработнай платы, капіталу, рэнты, эканам. крызісаў, даў адзін з варыянтаў фарміравання тэорыі гранічнай прадукцыйнасці.

Тв.: Рус. пер. — Избр. соч.: В 3 т. Т. 1. М., 1994.

ДЖО́РДЖТАЎН (Georgetown), горад, сталіца Гаяны. Размешчаны пры ўпадзенні р. Дэмерара ў Атлантычны ак. Каля 250 тыс. ж. з прыгарадамі (1994). Марскі порт. Чыг. станцыя, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: цукр., мукамольная, тытунёвая, маргарынавая, піваварная, дрэваапрацоўчая. Ун-т. Музей Гаяны. Бат. сад. Самы вял. ў свеце драўляны сабор (1889—92).

Засн. ў 1781 галандцамі пад назвай Табрак (ці Стабрук), з 1812 сучасная назва. З 1784 цэнтр галандскіх калоній у Паўн. Амерыцы. З пач. 19 ст. пад уладай англічан. У 1831—1966 цэнтр Брытанскай Гвіяны. У 1945 і 1951 знішчаны пажарамі. З 1966 сталіца *Гаяны*.

ДЖО́РДЖТАЎН (Georgetown), П і н а н г, горад у Малайзіі, на в-ве Пінанг каля зах. берага п-ва Малака. Адм. ц. штата Пінанг. Засн. ў 1786 брытанскай Ост-Індскай кампаніяй. 219,4 тыс. ж., з прыгарадамі каля 400 тыс. ж. (1993). Марскі порт, звязаны з мацерыком мостам і паромамі. Міжнар. аэрапорт. Гандл. цэнтр. Прам-сць: волаваплавільная, каўчукавая і гумавая, эл.-тэхн., тэкст., швейная, харчасмакавая, электронная, машынабудаўнічая. Зона свабоднага гандлю. Курорт. Арх. помнікі 18 і 19 ст.

ДЖО́РДЖЫЯ (Georgia), штат на ПдУ ЗША. Пл. 150 тыс. км². Нас. 6917 тыс. чал. (1993), больш як $^1/_4$ — негры. Гар. насельніцтва каля 70%. Адм. ц. і буйнейшы горад *Атланта*. Большая ч. тэр. занята нізінай прыморскай раўнінай. На Пн і ПнЗ адгор'і Апалачаў. Клімат субтрапічны, вільготны. Сярэдняя т-ра студз. 6—12 °С, ліп. 24—28 °С. Ападкаў 1300—1600 мм за год. Рэкі мнагаводныя, у нізоўях суднаходныя, найб. — Савана. Шыракалістыя (дуб, бук) і хвоевыя лясы займаюць 67% тэр. Індустрыяльна-агр. штат. Прам-сць: тэкст., харч., лесанарыхтоўчая, дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, маш.-буд., хім., швейная; буйныя авіяц. і аўтазборачныя прадпрыемствы. Гал. цэнтры Атланта, Агаста, Калумбус, Савана. Здабыча кааліну і буд. матэрыялаў. ГЭС на горных рэках. Марское рыбалоўства. У сельскай гаспадарцы пераважае жывёлагадоўля, асабліва птушкагадоўля і вырошчванне куранят-бройлераў. Гадуюць таксама буйн. раг. жывёлу і свіней. Гал. с.-г. культуры: арахіс, бавоўна, кукуруза, тытунь, сеяныя травы, соя. Транспарт аўтамаб., чыг., марскі. Гал. порт Савана. Каля Атланты міжнар. аэрапорт. Турызм.

Найбольш стараж. мясц. насельніцтва — індзейцы. У 1733 з'явіліся першыя перасяленцы з Англіі; з 1754 яе калонія (наз. па імю караля Георга II). У выніку *вайны за незалежнасць ў Паўночнай Амерыцы 1775—83* Дж. стала адным з першых штатаў-заснавальнікаў ЗША. У 18—19 ст. існавала плантацыйная гаспадарка, заснаваная на працы рабоў-неграў (вырошчвалі бавоўнік). У 1832—36 індзейцы выселены на З. У *грамадзянскую вайну ў ЗША 1861—65* эканам. цэнтр (разам з Атлантай) мяцежных паўд. штатаў. У 1866—68 мясц. тэрарыст. арг-цыі *ку-клукс-клана* сарвалі *Рэканструкцыю Поўдня 1865—77* у штаце. У 1870 паўторна прынята ў склад ЗША. У канцы 19 ст. актывізавалася індустрыялізацыя. У 1950—60-я г. скасаваны закон аб паліт. дыскрымінацыі і расавай сегрэгацыі неграў. *У.Я.Калаткоў* (гісторыя).

«ДЖО́РНАЛ ОВ БЕЛАРА́ШН СТА́ДЫЗ» («The journal of Byelorussian studies», «Часопіс беларускіх даследаванняў»), часопіс Англа-беларускага т-ва ў Вялікабрытаніі. Выдаваўся ў 1965—88 у Лондане на англ. мове 1 раз у год. Рэдактары А.Макмілін (1965—71), Дж. Дзінглі (1972—79), П.Мэё (1980—88). Распаўсюджваўся ва універсітэцкіх і грамадскіх б-кі, навук. ўстановы, суполкі, т-вы ў Англіі, ЗША, Канадзе, Ізраілі, Германіі, Польшчы і інш. краінах Усх. Еўропы, а таксама на Беларусі (да пач. 1990-х г. знаходзіўся ў спецсховах). Дасылаўся індывід. падпісчыкам. Друкаваў працы бел. даследчыкаў на эміграцыі і замежных вучоных па гісторыі Беларусі, беларусазнаўстве, бел. культуры, літаратуразнаўстве, моўназнаўстве і інш. Публікацыі часопіса вызначаюцца грунтоўнай крыніцазнаўчай базай, выкарыстаннем шматлікіх дакументаў па гісторыі Беларусі з архіваў і б-к на Захадзе, даследаванняў, зробленых на Беларусі. У 1972—79 друкаваў «выбраную беларускую бібліяграфію» (складальнік А.Надсон) публікацый пра Беларусь замежных аўтараў і даследчыкаў на Беларусі, навук. працы ін-таў гісторыі, л-ры і моваznаўства АН Беларусі. У раздзеле «Беларуская хроніка» (да 1980) асвятляў міжнар. дзейнасць Беларусі ў ААН, ЮНЕСКА, Міжнар. арг-цыі працы, эканам., рэліг. і грамадска-паліт. жыццё бел. дыяспары. Выйшаў 21 нумар у 6 т., у т.л. 2 здвоеныя. *Л.У.Языковіч.*

ДЖОС (Jos), плато ў Зах. Афрыцы, паміж рэкамі Нігер і Бенуэ, у цэнтр. ч. Нігерыі. Сярэднія выш. 1200—1400 м, найб. 1735 м (г. Шарэ). Паверхня слабахвалістая; ізалявана ўзвышаюцца гранітныя пікі, плоскавяршынныя ўзгоркі і конусы патухлых вулканаў. Складзена з дакембрыйскіх гнейсаў, сланцаў, кварцытаў, даламітаў, магматытаў, гранітаў. Клімат экватарыяльны мусонны; ападкаў больш за 1500 мм за год. Расліннасць — другасная высакатраўная саванна. Горна-рудны раён Нігерыі. Агульныя запасы волава 280 тыс. т. Буйнейшыя ў свеце радовішчы ніобію. Распрацоўваюцца танталавыя радовішчы.

ДЖО́ТА ДЫ БАНДО́НЕ [Giotto di Bondone; 1266 або 1267, Коле-ды-Веспіньяна (?), Італія — 8.1.1337], італьянскі жывапісец, прадстаўнік Протарэнесансу. Вучыўся, верагодна, у майстэрні

Джота ды Бандоне.

Чымабуэ. Працаваў пераважна ў Падуі і Фларэнцыі. З імем Дж. ды Б. звязаны паварот у развіцці італьян. жывапісу, яго разрыў з сярэдневяковымі канонамі і традыцыямі італа-візант. мастацтва 13 ст. Знаёмства з познаант. жывапісам і творамі П.*Каваліні* вызначыла далейшае развіццё творчасці Дж. ды Б. У 1304—06 ён стварыў вядомыя размалёўкі капэлы дэль Арэна (Скравены) у Падуі. Размешчаныя на сценах капэлы ў 3 ярусы размалёўкі перадаюць гісторыю жыцця Марыі і Хрыста ў выглядзе шэрагу драм. эпізодаў. Захаванне ў кожнай кампазіцыі адзінства часу і месца, энергічная пабудова аб'ёмаў і прасторы, прастата сітуацый і пластычная выразнасць жэстаў, светлы, святочны каларыт робяць размалёўкі выдатным творам протарэнесансавага жывапісу Італіі. У пач. 14 ст. Дж. ды Б. выканаў размалёўкі ў царкве Бадзія (1300—02, Фларэнцыя), а таксама некалькі алтарных абразоў, сярод якіх найб. вядомы «Мадонна Аньісанці» (1310—20, Фларэнцыя). У размалёўках капэл Перуцы (каля 1320) і Бардзі (1320—25) у фларэнційскай царкве Санта-Крочэ дасягнуў арган. сувязі з архітэктурай, стрыманасці каларыту і манументальнасці вобразаў. Аўтар праекта кампанілы (званіцы) фларэнційскага сабора Санта-Марыя дэль Ф'ёрэ (буд-ва пачата ў 1334).

Літ.: Данилова И. Джотто: [Альбом]. М., 1970.

ДЖОЎЛЬ (Joule) Джэймс Прэскат (24.12.1818, г. Солфард, Вялікабрытанія — 11.10.1889), англійскі фізік, адзін з першаадкрывальнікаў закону захавання энергіі. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1850). Навук. працы па эл.-магнетызме, цеплавых з'явах і кінетычнай тэорыі газаў. Адкрыў з'яву магн. насычэння (1840); устанавіў залежнасць



Дж.Джоўль.

колькасці цеплыні, што выдзяляецца ў правадніку пры працяканні праз яго эл. току, ад сілы току і супраціўлення правадніка (1841; гл. *Джоўля—Ленца закон*). Вызначыў мех. эквівалент цеплыні і даў тым самым эксперыментальны доказ захавання энергіі (1843). Разам з У.Томсанам адкрыў з'яву змянення т-ры газаў пры іх працяканні праз сітаватую перагародку (1853—54; гл. *Джоўля—Томсана эфект*). Яго імем названа адзінка энергіі і работы — *джоўль*.

Літ.: Голин Г.М., Филонович С.Р. Классики физической науки (с древнейших времен до начала XX в.). М., 1989.

ДЖО́ЎЛЬ, адзінка энергіі, работы і колькасці цеплыні ў СІ. Абазначаецца Дж. Названа ў гонар Дж.*Джоўля*. 1 Дж = 1Н·1м = 10^7 эрг = 0,2388 кал = = $6{,}25 \cdot 10^{18}$ эВ.

ДЖО́ЎЛЯ ЗАКО́Н, закон тэрмадынамікі, паводле якога ўнутр. энергія ідэальнага газу вызначаецца яго тэмпературай і не залежыць ад аб'ёму. Устаноўлены эксперыментальна Дж.П.*Джоўлем* у 1845. Вынікае з малекулярна-кінетычнай тэорыі ідэальнага газу. Адхіленні Дж.з. для рэальных газаў вызначаюцца энергіяй міжмалекулярнага ўзаемадзеяння (гл. *Джоўля—Томсана эфект*).

ДЖО́ЎЛЯ—ЛЕ́НЦА ЗАКО́Н, закон, які характарызуе цеплавое дзеянне эл. току. Паводле Дж.—Л.з. колькасць цеплыні Q, што выдзяляецца на ўчастку эл. ланцуга з супраціўленнем R пры працяканні па ім пастаяннага току I за час t, вызначаецца ў СІ формулай $Q = I^2Rt$. Устаноўлены Дж.П.*Джоўлем* у 1841 і эксперыментальна пацверджаны Э.Х.*Ленцам* у 1842. Выконваецца для асяроддзяў, у якіх праўдзіцца *Ома закон*; абагульняецца на выпадак пераменнага току (гл. Пойнтынга вектар).

ДЖО́ЎЛЯ—ТО́МСАНА ЭФЕ́КТ, змена т-ры газу пры стацыянарным адыябатным працяканні яго праз сітаватую перагародку (гл. *Дроселяванне*). Выяўлены і даследаваны Дж.П.*Джоўлем* і У.*Томсанам* у 1852—62. Паводле малекулярна-кінетычнай тэорыі будовы рэчыва Дж.—Т.э. сведчыць пра наяўнасць сіл міжмалекулярнага ўзаемадзеяння ў газе; вымярэнні дазваляюць устанавіць ураўненне стану рэальнага газу. Велічыня і знак Дж.—Т.э. вызначаюцца суадносінамі паміж работай газу і работай знешніх сіл, а таксама ўласцівасцямі самога газу, у прыватнасці памерамі малекул і іх узаемадзеяннем, напр., пры дроселяванні ад 20 да 0,1 МПа і пач. т-ры 290 К паветра ахалоджваецца на 35 К. Дж. — Т.э. пакладзены ў аснову многіх тэхн. спосабаў звадкавання газаў.

ДЖРБАША́Н Эдуард Мкртычавіч (н. 24.9.1923, Ерэван), армянскі літаратуразнавец. Акад. АН Арменіі (1982). Д-р філал. н., праф. (1967). Засл. дз. нав. Арменіі (1970). Скончыў Ерэванскі пед. ін-т (1950). З 1977 дырэктар Ін-та л-ры АН Арменіі. Даследуе тэорыю і гісторыю арм. л-ры, пытанні эстэтыкі, літ. жанраў і інш. Аўтар манаграфій «Светапогляд і майстэрства» (1967), «Пытанні паэтыкі» (1976), «Эстэтыка і літаратура» (1983), падручнікаў для школ і ВНУ, адзін з аўтараў «Гісторыі новай армянскай літаратуры» (1979), «Літаратуразнаўчага слоўніка» (2-е выд., 1980) і інш. Даследчык творчасці А.Туманяна, М.Налбандзяна і інш. Дзярж. прэмія Арменіі 1974 і 1980. *Д.Гаспарян*

ДЖУ́БА (Jubba), рака ў Эфіопіі і Самалі. Даўж. 1600 км (разам з гал. вытокам Гэнале), пл. бас. 750 тыс. км^2 (разам з р. Вебі-Шэбелі). Пачынаецца на Эфіопскім нагор'і, цячэ па плато Самалі, упадае ў Індыйскі ак. Сярэдні расход вады 550 м^3/с. У вільготныя сезоны (крас.—чэрв., вер.—ліст.) суднаходная ад г Бардэрэ; у вусці — марскі порт Кісмайо (Самалі).

ДЖУГАРА́ (Sorghum cernuum), від аднагадовых раслін з роду сорга сям. злакаў. Культывуюць як збожжавую і кармавую расліну ў Сярэдняй і Цэнтр. Азіі, трапічнай Афрыцы і інш. Вельмі засухаўстойлівая. Мае шчыльнае суквецце-мяцёлку з моцна пакарочанымі галінкамі, з выгнутым сцяблом пад суквеццем, якое звісае ўніз. Зерне Дж. (мае да 70% крухмалу) перапрацоўваюць на крупы, муку, спірт, крухмал, скормліваюць жывёле і птушкам. Зялёную масу сушаць і сіласуюць, сцёблы служаць палівам.

ДЖУГАШВІ́ЛІ Іосіф Вісарыёнавіч, гл. *Сталін* І.В.

ДЖУГДЖУ́Р, горы ўздоўж паўн.-зах. ўзбярэжжа Ахоцкага м., у Хабараўскім краі Расіі. Выцягнуты дугой на 700 км. Пераважаюць выш. 800—1200 м, найвыш. 1906 м (г. Топка). Складзены з магматычных, часткова асадкавых парод. Пашырана шматгадовая мерзлата. Клімат умерана халодны, мусонны, з суровай зімой. На зах. схіле светлахвойная горная тайга з перавагай даурскай лістоўніцы, на ўсх. — ахоцкая горная тайга з аянскай елкі. Зубчастыя гальцы

Джота да Бандоне. Фрэска «Уезд Хрыста ў Іерусалім» у капэле дэль Арэна ў Падуі. 1304—06.

заняты кедравым сланікам і горнай тундрай.

ДЖУ́ЛІО РАМА́НА [Giulio Romano; сапр. Піпі, Pippi; 1492 або 1499, Рым — 1.11.1546], італьянскі архітэктар і жывапісец. У 1515—24 працаваў у Рыме. Вучань *Рафаэля*, разам з якім размалёўваў Станцы і Лоджыі Ватыкана, пасля смерці настаўніка завяршыў размалёўку вілы Мадама (1521). З 1524 працаваў у Мантуі пры двары герцагаў Ганзага. Паступова адышоў ад класічных прынцыпаў мастацтва Высокага Адраджэння да *маньерызму*. Яго жывапісным творам уласцівы кампазіцыйная перагружанасць, ускладненасць ракурсаў і поз. У арх. пабудовах падкрэсленая пластыка і кантрастнасць формаў, мудрагелістая фактура руставаных паверхняў (асабісты дом у Мантуі, 1544) часта спалучаюцца з нечаканымі вонкавымі эфектамі, якія парушаюць строгую тэктоніку ордэрнай сістэмы (Палацца Дукале ў Мантуі, 1538—39). У сваім гал. творы — Палацца дэль Тэ ў Мантуі (1525—34) прадвызначыў далейшыя шляхі архітэктуры, стварыў адзін з ранніх прыкладаў восевай кампазіцыі.

ДЖУМАХМА́ТАЎ Асанхан Джумахматавіч (н. 16.7.1923, г. Арашан, Кыргызстан), кіргізскі дырыжор. Нар. арт. СССР (1976). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1958, клас Б.*Хайкіна*). З 1948 дырыжор (з перапынкам), у 1973—83 гал. дырыжор Кіргізскага т-ра оперы і балета. У 1962—76 адначасова гал. дырыжор Аркестра нар. інструментаў імя К.Арозава, з 1969 Сімф. аркестра радыё і тэлебачання Кыргызстана. Муз. кіраўнік многіх оперных і балетных спектакляў. Старшыня Кірг. муз. т-ва (з 1987). Дзярж. прэмія Кыргызстана 1972.

ДЖУНГА́РСКАЯ РАЎНІ́НА, Джунгарыя, раўнінная вобласць паміж гарамі Алтая і Усх. Цянь-Шаня, на ПнЗ Кітая. Пл. каля 700 тыс. км^2, пераважныя выш. 600—800 м. Складзена з магутнага покрыва рыхлых адкладаў. Пустыні з масівамі градавых і барханавых пяскоў, саланчакі. Асобныя невысокія горныя кражы і драбнасопачнік. Клімат умераны кантынентальны, з гарачым сухім летам і халоднай сухой зімой. Сярэдняя т-ра студз. ад -20 да -25 °С, ліп. ад 20 да 25 °С з рэзкімі ваганнямі на працягу сутак. Рачная сетка рэдкая. Разрэджаная ксерафітная расліннасць (саксаул, тамарыск, палыны, салянкі). Пашавая жывёлагадоўля, месцамі аазісы. Радовішчы нафты.

Джуліо Рамана. Размалёўка «Залы гігантаў» Палацца дэль Тэ ў Мантуі.

ДЖУНГА́РСКІ АЛАТА́Ў, горная сістэма ў Сярэдняй Азіі, паміж воз. Алаколь і р. Ілі, у Казахстане і часткова ў Кітаі. Працягнулася з ПдЗ на ПнУ амаль на 450 км, шыр. ад 50 да 190 км. Складаецца з некалькіх паралельных хрыбтоў: Каратау, Баскантау, Таксанбай, Беджынтау і інш. Выш. ад 1500 да 3000 м, найб. — 4464 м (г. Бесбаскан). Паўн. раёны ўтвораны з пясчанікаў, алеўрытаў і сланцаў, паўднёвыя — з вулканагенных парод; у цэнтр. ч. выходзяць стараж. крышт. пароды. Радовішчы поліметал. руд, медзі, рэдкіх металаў; тэрмальныя мінер. крыніцы. Характэрна змена вышынных ландшафтных паясоў: на ніжніх схілах — пустыні, паўпустыні і стэп, які на выш. 1200 м пераходзіць у леса-лугавы пояс, вышэй 2600 м — субальпійскія і альпійскія лугі. Ледавікі (агульная пл. больш за 1000 км^2), у т.л. ледавікі Джамбула і Берга.

ДЖУНГА́РСКІЯ ВАРО́ТЫ, горны праход паміж хрыбтамі Джунгарскі Алатау на З і Барлык на У, у Казахстане, паблізу мяжы з Кітаем. Злучае Балхаш-Алакольскую катлавіну і *Джунгарскую раўніну*. Даўж. каля 50 км, шыр. да 10 км, выш. 300—400 м. Пераважае паўпустынны ландшафт. У старажытнасці Дж.в. служылі праходам для качэўнікаў Цэнтр. Азіі і Казахстана.

ДЖУ́НГЛІ (англ. jungle ад джангал, на мове хіндзі — лес, зараснікі), дрэвавахмызняковыя зараснікі ў спалучэнні з высокімі грубасцяблістымі дрэвападобнымі злакамі (гіганцкім бамбукам, цукр. трыснягом, эрпантусам і інш.). Звычайна густыя, месцамі абвітыя лянамі. Характэрны для вільготных мусонных абласцей тропікаў, пераважна ў Паўд. (Індастан) і Паўд.-Усх. Азіі (Індакітай, Зондскія а-вы); трапляюцца ў пераўвільготненых субтрапічных абласцях (Д. Усход і інш.). Часам Дж. памылкова называюць цяжкапраходныя ўчасткі забалочаных трапічных лясоў.

ДЖУ́НТА (італьян. giunta), выканаўчы орган муніцыпалітэта ў камунах, правінцыях і абласцях Італіі. Выбіраецца на 4 гады адпаведнымі муніцыпальнымі саветамі з ліку іх членаў. На чале Дж. ў камунах стаіць сіндык (мэр), у правінцыях і абласцях — прэзідэнт муніцыпальнага савета. Рашэнні Дж. кантралююцца прадстаўнікамі цэнтр. улады — прэфектамі правінцый і абл. камісарамі. Важныя рашэнні ніжэйстаячых муніцыпальных органаў зацвярджаюць вышэйстаячыя Дж.

ДЖУРА́ Султан (1910, кішлак Кагалтам Бухарскай вобл., Узбекістан — 14.11.1943), узбекскі паэт. Удзельнік баёў за вызваленне Беларусі ў гады Вял. Айч. вайны (пахаваны ў в. Казярогі Лоеўскага р-на). Скончыў Бухарскі пед. тэхнікум (1930). Друкаваўся з 1927. Аўтар паэт. зб-каў «Самаадданы» (1939),

«Масква» (1941), у якіх апаэтызаваў родны край, дружбу, каханне, патрыятызм моладзі, гераізм бел. народа ў змаганні з фашызмам. На бел. мову яго творы пераклалі А.Астрэйка, С.Ліхадзіеўскі, К.Паўтаржыцкі, К.Цвірка.

Тв.: Рус. пер. — Рождение истины. Ташкент, 1961.

ДЖУРАКУ́ЛАЎ Умаркул (люты 1894, г. Самарканд, Узбекістан — 22.3.1973), узбекскі майстар маст. керамікі; стваральнік школы сучаснай самаркандскай керамікі. Нар. мастак Узбекістана (1953). Фармоўцы вучыўся ў свайго бацькі Джуракула Кабулава, размалёўцы — у майстра У.Умарава з г.Гіждуван. Пачаў працаваць у 1902. Аўтар аздобленых падглазурнай размалёўкай збаноў са складаным рэльефным узорам, разнастайных пасудзін у форме птушак або драконаў, фігурак жывёл.

Джут.

ДЖУСО́ЙТЫ (Джусоеў) Нафі Рыгоравіч (н. 27.2.1925, в. Ногкаў, Паўд. Асеція), асецінскі пісьменнік і літ.-знавец. Д-р філал. н. (1968). Паэтычны дэбют — зб. «Сэрца салдата» (1949), у якім складаны свет думак, пачуццяў, душэўных перажыванняў сав. воіна ў гады вае. выпрабаванняў. У кнігах паэзіі «Лірыка» (1955), «Думы Асеціі» (1959), «Безыменная кніга» (1967), гіст. раманах «Кроў продкаў» (1965), «Дванаццаць ран як адна...» (1970), «Слёзы Сырдона» (1979), п'есе ў вершах «Світальная зара» (1977), аповесці «Сонцаварот» (1965) — мінулае і сучаснае асецінскага народа, складаныя чалавечыя лёсы, харство роднай зямлі. Даследуе гісторыю асецінскай л-ры. Літ. прэмія імя К.Хетагурава 1979. Пераклаў на асецінскую мову асобныя творы Я.Купалы. На бел. мову асобныя творы Дж. пераклаў Г.Кляўко.

Тв.: Рус. пер. — Реки вспять не текут: Повести. М., 1981.

«ДЖУСТЫ́ЦЫЯ Э ЛІБЕРТА́» (італьян. «Giustizia e libertà» «Справядлівасць і свабода»), антыфашысцкі рух італьян. эмігрантаў у Францыі ў 1929—40. Палiт. праграма руху (распрацавана ў 1931) прадугледжвала барацьбу за ўстанаўленне рэспублікі, нацыяналізацыю прам-сці, адм. рэформу і аўтаномію абласцей, аддзяленне царквы ад дзяржавы і інш. Меў кантакты з італьян. камуністамі. Лідэры: К.Раселі, Э.Лусу, А.Таркʼяні, А.Чанка і інш. Пасля акупацыі б. ч. Францыі ням.-фаш. войскамі (1940) рух распаўся.

ДЖУТ (Corchorus), род кветкавых раслін сям. ліпавых. Каля 100 відаў. Пашыраны ў трапічных раёнах Азіі, Афрыкі, Амерыкі і Аўстраліі.

Кусты, паўкусты, шмат- і аднагадовыя травяністыя расліны. Лісце чаргаванае, цэласнае. Кветкі дробныя, двухполыя. Плод — рабрыстая каробачка. Аднагадовыя віды — Дж. караткаплодны (C. capsularis) і даўгаплодны (C. olitorius) — *валакністыя расліны* выш. да 3 м; вырошчваюцца ў Індыі, Пакістане, Сярэдняй Азіі. Даюць трывалае валакно, якое ідзе на выраб тэхн. і інш. тканін, дываноў, вяровак і інш. Лісце і маладыя парасткі спажываюцца як агародніна.

ДЖУ́ЧЫ (? — 1227), мангольскі хан,ваеначальнік. Старэйшы сын *Чынгісхана*. У 1207—08 кіраваў паходам у Паўд. Сібір, далучыў да Манг. імперыі Туву, Хакасію, Алтай. Удзельнічаў у паходах Чынгісхана ў Паўн. Кітай (1211—15), Сярэднюю Азію (1219—22), Усх. *Дэшті-Кіпчак* (гл. *Мангольскія заваяванні*). З 1224 правіцель Харэзма і Дэшт-і-Кіпчака. Памёр раптоўна пры нявысветленых абставінах.

ДЖХУКА́Р, археалагічная культура эпохі энеаліту (16—15 ст. да н.э.) на тэр. Сінда (Зах. Пакістан). Прасочваецца на некат. помніках, у т.л. каля сучаснага паселішча Джхукар, дзе змяняе *Інда даліны цывілізацыю*. Характэрная двухкаляровая кераміка, якая мае аналагі з Белуджыстанам. Выяўлены своеасаблівыя пячаткі з каменю, фаянсу і гліны, медныя шпількі, правушныя сякеры, характэрныя для тэр. Сярэдняга Усходу. Некат. даследчыкі звязваюць развіццё Дж. з *арыйцамі*.

А.В.Іоў.

ДЖЫБУ́ЦІ (Djibouti), Рэспубліка Джыбуці (République de Djibouti), дзяржава на ПнУ Афрыкі. Мяжуе на Пн з Эрытрэяй, на З і Пд з Эфіопіяй, на ПдУ з Самалі. На У абмываецца Баб-эль-Мандэбскім пралівам і Адэнскім зал. Індыйскага ак. Падзяляецца на 5 акруг. Пл. 22 тыс. км^2. Нас. 557 тыс. чал. (1993). Сталіца — г. *Джыбуці*. Афіц. мова — арабская і французская. Нац. свята — Дзень незалежнасці (27 чэрв.).

Дзяржаўны лад. Дж. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1992. Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца насельніцтвам на 6 гадоў. Вышэйшы прадстаўнічы орган — аднапалатны Нац. сход (65 дэпутатаў), выбіраецца насельніцтвам на 5 гадоў. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад на чале з прэм'ер-міністрам.

Прырода. Для рэльефу характэрна чаргаванне горных масіваў з патухлымі вулканамі і нізкіх лававых плато. Цэнтр. ч. краіны займаюць камяністыя, пясчаныя або гліністыя раўніны. На ПнУ адгор'і хр. Данакіль (г. Муса-Алі, 2022 м). У глыбокай тэктанічнай упадзіне воз. Асаль (на 153 м ніжэй узр. м.). Клімат трапічны, сухі і гарачы. Сярэднямесячныя т-ры 27—35 °С. Ападкаў 45—130 мм за год. Пастаянных рэк няма. Расліннасць пустынная і паўпустынная. Нац. паркі Дай, Маскалі-Мусша, некалькі рэзерватаў.

Герб і сцяг Джыбуці.

Насельніцтва. Рэспубліку насяляюць 2 народы, якія размаўляюць на мовах кушыцкай групы семіта-хамітскай сям'і: іса (блізкія да самалійцаў, 50%) і афары (40%). Жывуць таксама самалійцы, арабы, выхадцы з Еўропы (французы, грэкі, італьянцы) і інш. 94% вернікаў мусульмане. Сярэдняя шчыльн. насельніцтва 25,3 чал. на 1 км^2. 82% яго пражывае ў гарадах і пасёлках на ўзбярэжжы і на ПдУ, у т.л. больш за палавіну ў г. Джыбуці. Ва ўнутр. раёнах пераважаюць качэўнікі і паўкачэўнікі.

Гісторыя. У 1880-я г. тэр. п-ва Самалі падзелена паміж Англіяй і Францыяй. Калонія Франц. Самалі ў 1946 атрымала статус «заморскай тэр. Францыі», у 1956 — частковую

аўтаномію. У ходзе рэферэндуму 1967 большасць насельніцтва выказалася за аўтаномію ў рамках Франц. Рэспублікі і краіна з чэрв. 1967 стала афіцыйна наз. Франц. тэр. афараў і іса. У 1970-я г. ў краіне і за мяжой узнік моцны незалежніцкі рух сярод іса, дыскрымінаваных французамі на карысць афараў. У 1972 створана Афр. нар. ліга (з 1975 Афр. нар. ліга за незалежнасць). У эміграцыі дзейнічалі вызв. партыі, у т.л. тыя, што выступалі за аб'яднанне з Самалі ці Эфіопіяй.

8.5.1977 абвешчана незалежная дзяржава пад назвай Рэспубліка Джыбуці; ролю канстытуцыі ў краіне выконвалі «арганічныя законы». Унутрыпаліт. напружанасць у 1990—92 выклікала сутыкненні кланава-племянных інтарэсаў афараў і іса. Афарская апазіцыя стварыла Фронт за аднаўленне адзінства і дэмакратыі, разгарнула антыўрадавыя ўзбр. выступленні. У чэрв. 1992 гэты Фронт разам з інш. апазіцыйнымі партыямі і рухамі, у т.л. і прадстаўнікамі інтарэсаў іса, утварылі Аб'яднаны фронт апазіцыі. 4.9.1992 на рэферэндуме ўпершыню прынята канстытуцыя. У маі 1993 прэзідэнтам краіны выбраны Х.Гулед Апцідон. Дж. — чл. ААН з 1977. Паліт. партыі — Нар. аб'яднанне за прагрэс (правячая), Партыя дэмакр. абнаўлення, Нац.-дэмакр. партыя.

Гаспадарка. Дж. — адна з найменш развітых краін свету. Штогадовы даход на душу насельніцтва каля 300 долараў. Гасп. дзейнасць абмежавана неспрыяльнымі прыроднымі ўмовамі. Доля ў валавым унутр. прадукце: транспарту і сферы паслуг — каля 85%, прам-сці — каля 10%, сельскай гаспадаркі — каля 4%. Найб. развіта абслугоўванне трансп. аперацый праз порт Джыбуці, дзе канчаецца чыгунка і аўтадарога, якія злучаюць Эфіопію з узбярэжжам. $^3/_4$ грузаабароту порта — транзітныя грузы, праз яго праходзіць каля палавіны знешняга гандлю Эфіопіі. Даўж. чыгункі 106 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 283 км. Каля г. Джыбуці міжнар. аэрапорт. Прам-сць прадстаўлена невял. паўсаматужнымі прадпрыемствамі па вытв-сці харч. прадуктаў, скураных вырабаў, буд. матэрыялаў, мех. і швейнымі майстэрнямі. Ёсць некалькі невял. электрастанцый, з-д мінер. вод, малаказавод, камбікормавы з-д, тэкст. прадпрыемствы. Суднарамонт і буд-ва невял. суднаў. Лоўля рыбы і крабаў, збор жэмчугу і перламутру, каралаў, губак. Здабыча кухоннай солі з марской вады, вапняку, перліту. Саматужныя промыслы: ювелірны (вырабы з серабра, упрыгожаныя жэмчугам, перламутрам, каралямі), гарбарны (вырабы з ціснёнай скуры — сёдлы, зброя, бурдзюкі і інш.). Гал. крыніца існавання сельскага насельніцтва — качавая і паўкачавая жывёлагадоўля. Пагалоўе (тыс. гал.): авечак і коз каля 1000, вярблюдаў каля 40, буйн. раг. жывёлы каля 50. Пад пашай каля 12% тэрыторыі. Выкарыстоўваюцца таксама сезонныя пашы па-за межамі краіны, пераважна ў Эфіопіі. Для земляробства прыдатныя толькі 7 тыс. га зямель у аазісах. Вырошчваюць фінікавую пальму, каву, агародніну. Дж. экспартуе жывёлу і скуры, імпартуе харч. і прамысл. тавары. Імпарт перавышае экспарт у 10 разоў. Асн. гандл. партнёры: Францыя (57% экспарту, 26% імпарту), Емен, Саудаўская Аравія. Краіна атрымлівае штогадовую дапамогу ад міжнар. арг-цый і Францыі. Грашовая адзінка — джыбуційскі франк.

І.Я.Афнагель (прырода, гаспадарка).

ДЖЫБУ́ЦІ (Djibouti), горад, сталіца дзяржавы Джыбуці. Засн. ў 1888. 290 тыс. ж. (1989). Свабодны (з 1981) порт у зал. Таджура (ч. Адэнскага зал.), мае вял. значэнне для знешняга гандлю Эфіопіі. Вываз скур і кавы, увоз нафты і нафтапрадуктаў, прамысл. абсталявання. Пачатковая чыг. станцыя на чыгунцы ў Эфіопію. Вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-прамысл. цэнтр краіны. Харч. прам-сць. Суднаверф.

ДЖЫГАРХАНЯ́Н Армен Барысавіч (н. 3.10.1935, Ерэван), армянскі і расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1985). Скончыў Ерэванскі маст.-тэатр. ін-т (1958). У 1955—66 у Рус. драм. т-ры (Ерэван), у 1969—96 у т-ры імя У.Маякоўскага, з 1996 у «Ленкоме» (Масква). Акцёр моцнага тэмпераменту, майстар пераўвасаблення, стварае тонкі і заўсёды дакладны псіхал. малюнак вобраза. Сярод роляў: Стэнлі Кавальскі («Трамвай «Жаданне» Т.Уільямса), Сакрат і Нерон («Гутаркі з Сакратам» і «Тэатр часоў Нерона і Сенекі» Э.Радзінскага), Хлудаў («Бег» М.Булгакава), Мэндэль Крык («Захад сонца» І.Бабеля). З 1960 здымаецца ў кіно («Добры дзень, гэта я!», «Калі настае верасень», «Жураўлік», «Тэгеран-43») і тэлефільмах («Аперацыя «Трэст», «Нікало Паганіні», «Добры дзень, я ваша цёця», «Месца сустрэчы змяніць нельга», «Сабака на сене» і інш.). Дзярж. прэміі Арменіі 1975, 1979.

ДЖЫ́ДА, горад на З Саудаўскай Аравіі. Каля 1,5 млн. ж. (1994). Порт на Чырвоным м. Міжнар. аэрапорт. Транзітны пункт паломнікаў-мусульман, якія накіроўваюцца ў святыя месцы Меккі і Медыны. Гандл.-прамысл. цэнтр. Прам-сць: нафтаперапр., нафтахім., цэм., мэблевая, гарбарна-абутковая, тэкст., харчовая. Сталепракатны, аўтазборачны, суднарамонтны, папяровы, змазачных масел з-ды. Будаўніцтва невял. суднаў. Апрацоўка мармуру. Вытв-сць прадметаў рэліг. культу. Ун-т.

ДЖЫДЗІ́ННЕ, вадасховішча ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., за 3 км на З ад в. Тышкавічы. Створана ў 1983 на месцы аднайм. возера. Пл. 2,5 км^2, даўж. 2,2 км, найб. шыр. 2 км, найб. глыб. 4,7 м, аб'ём вады 7 млн. м^3. Напаўняецца вадой з р. Ясельда ў час веснавой паводкі. Схілы катлавіны спадзістыя, пясчаныя. Берагі нізкія, забалочаныя, месцамі пад лесам. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель, рэкрэацыі.

ДЖЫЁК (Giauque) Уільям Фрэнсіс (12.5.1895, г. Ніягара-Фолс, Канада — 29.3.1982), амерыканскі фізікахімік. Чл.

У.Ф.Джыёк.

Нац. АН ЗША (1936) і Амер. акадэміі мастацтва і навук (1950). Скончыў Каліфарнійскі ун-т у Берклі (1920), дзе і працаваў (з 1934 праф.). Навук. працы па вывучэнні тэрмадынамічных уласцівасцей рэчываў (кандэнсаваных газаў) пры звышнізкіх т-рах. Распрацаваў метад адыябатычнага размагнічвання для атрымання тэмператур ніжэй за 1 К (1927, метад магнітнага ахаладжэння) і дасягнуў т-ры 0,25 К (1933). Даказаў існаванне цяжкіх ізатопаў кісларода ^{17}O і ^{18}O (1929). Нобелеўская прэмія 1949.

ДЖЫ́ЛАНГ (Geelong), горад на Пд Аўстраліі, у штаце Вікторыя. Прымыкае да зах. прыгарадаў г. Мельбурн. 151,8 тыс. ж. (1993). Порт у зах. частцы зал. Порт-Філіп Ціхага ак., найбуйнейшы ў Паўд. паўшар'і па вывазе збожжа. Чыг. вузел. Прам-сць: маш.-буд. (аўтамабілі і с.-г. машыны), чорная і каляровая металургія, нафтаперапр., баваўняная і шарсцяная, мясакансервавая, хім. (перапрацоўка фасфатаў), шкляная.

ДЖЫЛАЎДА́РЫ Ігар Захаравіч (н. 9.8.1945, г. Гомель), бел. фізік. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1993). Скончыў БДУ (1968). З 1968 у Ін-це фізікі АН Беларусі, з 1978 у БПА. Навук. працы па оптыцы і тэарэт. механіцы. Даследаваў асаблівасці адбіцця святла ад узмацняльных і нелінейных асяроддзяў. Распрацаваў тэорыю і прынцыпы пабудовы адчувальнага элемента індукцыйнага

гравітацыйнага градыентаметра для рухомых аб'ектаў.

Тв.: Отражение плоской световой волны от нелинейной прозрачной изотропной среды (разам з Б.Б.Бойкам, М.С.Пятровым) // Журн. прикладной спектроскопии. 1975. Т. 23, № 5.

ДЖЫ́ЛЫ (Gigli) Беньяміна (20.3.1890, г. Рэканаці, Італія — 30.11.1957), італьянскі спявак (тэнар); адзін з буйнейшых прадстаўнікоў мастацтва *бельканта* 1-й пал. 20 ст. З 1914 спяваў на оперных сцэнах Італіі (у т.л. «Ла Скала») і інш. краін, з 1954 у канцэртах. Валодаў голасам рэдкай прыгажосці, аднароднага гучання ва ўсіх рэгістрах, што дазваляла яму выконваць партыі лірычнага і драм. тэнара: Немарына, Эдгар («Любоўны напітак», «Лючыя ды Ламермур» Г.Даніцэці), Надзір («Шукальнікі жэмчугу» Ж.Бізэ), Радамес («Аіда» Дж. Вердзі), Каніо («Паяцы» Р.Леанкавала), Каварадосі («Тоска» Дж. Пучыні). Вядомы як выканаўца неапалітанскіх песень. Здымаўся ў муз. фільмах, у т.л. «Авэ Марыя», «Ты маё шчасце», «Джузепе Вердзі», «Паяцы», «Голас у тваім сэрцы» і інш.

Літ. тв.: Рус. пер. — Воспоминания. 2 изд. М.; Л., 1967.

ДЖЫМА́РА, вяршыня Вял. Каўказа ў Грузіі, за 9 км на З ад гары Казбек. Выш. 4780 м. Складзена з гліністых сланцаў, метамарфічных парод і дыябазаў. Укрыта снегам, на схілах ледавікі (агульная пл. зледзянення 37 км^2).

ДЖЫ́Н (англ. gin), ядлаўцовая гарэлка, моцны алкагольны напітак (каля 45 аб'ёмных працэнтаў спірту). Атрымліваюць перагонкай спіртавога настою сушаных ядлаўцовых ягад з дабаўленнем (у залежнасці ад маркі) розных прыпраў (апельсінавых скарынак, каранёў дзягілю і інш.).

ДЖЫ́НА Мухамед Алі (25.12.1876, г. Карачы, Пакістан — 11.9.1948), палітычны і дзярж. дзеяч Індыі і Пакістана. У 1892—96 вучыўся ў Англіі. Адвакат. Чл. *Індыйскага нацыянальнага кангрэса* (з 1906) і *Мусульманскай лігі* (у 1913, 1916, 1920 і з 1934 яе лідэр). З 1940 ініцыятар і кіраўнік руху за стварэнне ў мусульманскай частцы Індыі асобнай дзяржавы Пакістан. У 1947—48 1-ы ген.-губернатар Пакістана. Ушаноўваецца ў гэтай дзяржаве як яе стваральнік.

ДЖЫНС (Jeans) Джэймс Хопвуд (11.9.1877, Лондан — 16.9.1946), англійскі фізік і астрафізік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1906). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1900), дзе і працаваў у 1901—04 і 1910—12. У 1905—09 у Прынстанскім ун-це, у 1923—44 у абсерваторыі Маўнт-Вілсан (ЗША). Навук. працы па кінетычнай тэорыі газаў, тэорыі цеплавога выпрамянення, будове і эвалюцыі зорак, зорных сістэм і туманнасцей. Незалежна ад Дж.*Рэлея* вывеў формулу размеркавання энергіі ў спектры выпрамянення абсалютна чорнага цела (гл. *Рэлея—Джынса закон выпрамянення*). Аўтар адной з касмаганічных гіпотэз. Каралеўскі медаль (1919).

Тв.: Рус. пер. — Вселенная вокруг нас. М.; Л., 1932; Движение миров. М., 1933.

Дж.Джынс.

«ДЖЫП» (Jeep), марка легкавых і грузапасажырскіх аўтамабіляў павышанай праходнасці рознага прызначэння. Выпускаюцца аднайм. аддзяленнем амер. канцэрна «Крайслер» з 1963. Прататып — армейскія аўтамабілі «Віліс» і «Форд», якія выпускаліся ў гады 2-й сусв. вайны. Мадэлі поўна- або заднепрывадныя (з магчымасцю далучэння пярэдняга прывода); магутнасць рухавіка да 89—162 кВт, найб. скорасць да 180 км/гадз, аб'ём грузавога адсека 0,35—2,2 м^3.

ДЖЫ́У-ДЖЫ́ЦУ (ад яп. дзю мяккасць + дзюцу мастацтва, умельства), японская сістэма самаабароны і нападзення без зброі. Асн. прыёмы: удары ў найб. слабыя часткі чалавечага цела (сонечнае спляценне, сонная артэрыя, печань і інш.), выкручванні і перагінанні суставаў рук і ног у спалучэнні з рознымі кідкамі і задушлівымі захватамі.

Вытокі Дж.-дж. ў нар. прыёмах самаабароны без зброі, вядомых у Японіі са старажытнасці. Сфарміравалася да 13—14 ст., у 14—19 ст. вельмі пашырылася ў Японіі як сістэма фіз. і баявой падрыхтоўкі самураяў. У канцы 19 ст. шляхам адбору і мадэрнізацыі элементаў Дж.-дж. створана барацьба *дзюдо*.

ДЖЫХА́Д (араб. літар. намаганне), адно з асн. паняццяў у *ісламе* і адзін з гал. рэліг. абавязкаў мусульман-мужчын. У сярэдневякоўі азначала ўзбр. змаганне з няверным (немусульманамі) у імя пашырэння (захавання) мусульм. ўплыву ў свеце («свяшчэнная вайна», або газават ці фатх). Пазней Дж. стаў разглядацца як духоўнае ўдасканаленне ісламскіх вернікаў праз іх пэўныя намаганні (пераадоленне чалавечых слабасцей і шкодных звычак, пакаранне злачынцаў і парушальнікаў маральных нормаў). У гісторыі мусульм. краін ідэя Дж. выкарыстоўвалася для ўзмацнення рэліг. пачуццяў вернікаў (нярэдка ў форме фанатызму) і згуртавання насельніцтва ў час унутр. і знешніх войнаў, у т.л. нац.-вызв. паўстанняў. Часам лозунгам Дж. імкнуцца абгрунтаваць свае дзеянні тэрарысты-мусульмане. *У.С.Кошалеў.*

Да арт. «Джып». Грузапасажырскі аўтамабіль «Джып-Чэрокі».

ДЖЭ́ВАНС (Jevons) Уільям Стэнлі (1.9.1835, г. Ліверпул, Вялікабрытанія — 13.8.1882), англійскі эканаміст, статыстык і філосаф-логік. Праф. логікі, філасофіі і паліт. эканоміі ў Манчэстэры (1866—76) і Лондане (1876—80). Заснавальнік матэм. школы ў паліт. эканоміі, адзін з заснавальнікаў *граничнай карыснасці тэорыі*. З эканам. прац найб. вядомая «Тэорыя палітычнай эканоміі» (1871). Гал. праблему эканам. навукі бачыў у вывучэнні спажывання, асн. законам якога лічыў закон убываючай карыснасці. Даследаваў праблемы грашовага абарачэння, індэкса цэн, тэорыі эканам. цыклаў, матэм. логікі і інш. Стварыў адну з першых лагічных машын (1869), звязаў тэорыю лагічнай індукцыі з тэорыяй імавернасці.

ДЖЭЗКАЗГА́Н, горад у Казахстане, цэнтр Джэзказганскай вобл. Засн. ў 1938 у сувязі з распрацоўкай медных, жал. і марганцавых руд. 109 тыс. ж. (1992). Чыг. станцыя. Здабыча і перапрацоўка меднай руды. Каляровая металургія, лёгкая і харч. прам-сць. Пед. ін-т. Музеі гіст.-краязнаўчы і касманаўтыкі.

ДЖЭЙМС, Джэмс (James), назва 2 рэк у ЗША. 1) Рака ў штаце Віргінія. Даўж. каля 550 км, пл. бас. 25,1 тыс. км^2. Пачынаецца ў Апалачах, перасякае хр. Блу-Рыдж (у цясніне Жалезныя Вароты), плато Підмант, на ўступе якога ўтварае вадаспады, цячэ па Прыатлантычнай нізіне, упадае ў Чэсапікскі заліў Атлантычнага ак. Сярэдні расход вады каля г. Рычманд 210 м^3/с. Да гэтага горада рака суднаходная. У вусці — марскі порт Норфалк. 2) Рака ў штатах Паўн. і Паўд. Дакота, левы прыток р. Місуры. Даўж. каля 1140 км, пл. бас. 57,2 тыс. км^2. Пачынаецца на плато Місуры, цячэ па шырокай даліне паралельна ўсх. ўступу Вял. раўнін. Каротказасовае веснавое разводдзе. Высокія летнія паводкі. Выкарыстоўваецца для арашэння.

ДЖЭЙМС (James) Генры (15.4.1843, Нью-Йорк — 28.2.1916), амерыканскі пісьменнік. Брат філосафа і псіхолага У.*Джэмса*. Вучыўся ў Гарвардскім ун-це. З 1875 жыў у Англіі. Сябраваў з І.Тургеневым, творчасць якога (а таксама Н.Хотарна) паўплывала на фарміра-

ванне эстэт. поглядаў Дж. Аўтар больш як 20 раманаў, у т.л. «Американец» (1877), «Вашынгтонская площча» (1880), «Жаночы партрэт» (1881), «Бостанцы» (1886), «Нязручны ўзрост» (1899), «Залатая чаша» (1904), аповесцей, у т.л. «Дэйзі Мілер» (1879), «Урок майстра» (1892), літ.-крытычнага даследавання «Майстэрства рамана» (1834), больш за 100 апавяданняў, а таксама п'ес, навел і эсэ. Дж. разважаў над узаемаадносінамі Новага і Старога свету (амер. і еўрап. культ. традыцыямі), вытокамі нац. амер. менталітэту. Яго прозе ўласцівы прытчавасць, сімвалічная абагульненасць вобразаў, рэфлексіўнасць.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. Т. 1—2. Л., 1979; Повести и рассказы. М., 1983.

Е.А.Лявонава.

ДЖЭЙРА́Н (Gazella subgutturosa), млекакормячае роду газелей сям. пустарогіх. Пашыраны ў Пярэдняй і Цэнтр. Азіі, Усх. Закаўказзі, Казахстане. Жыве ў пустынях, паўпустынях і перадгор'ях, трымаецца групамі. Падвід Дж. з Аравійскага п-ва (G. s. marica) занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. цела 93—116 см, выш. ў карку 60—75 см, маса 18—33 кг. У самцоў чорныя ліраладобныя рогі даўж. да 41 см, самкі бязрогія. Афарбоўка верху цела і бакоў пясчаная, ніз цела, шыя і ўнутр. бакі ног белыя. Каля хваста невял. белае «люстэрка». Корміцца травяністымі і хмызняковымі раслінамі. Нараджае 1—2 дзіцянят. Для развядзення Дж. ва Узбекістане і Туркменіі створаны гадавальнікі.

ДЖЭЙТУ́Н, рэшткі стараж. паселішча земляробаў і жывёлаводаў у Сярэдняй Азіі (5-е тыс. да н.э.), за 30 км на Пн ад Ашгабата (Туркменістан). Паселішча складалася з невял. глінабітных аднапакаёвых домікаў. Знойдзена зерне пшаніцы і ячменю, косці дзікіх і свойскіх жывёл, прылады працы з крэменю і косці, гліняны посуд, размаляваны простым геам. узорам, каменныя і гліняныя фігуркі жывёл.

ДЖЭЙХА́Н (Ceyhan), рака на Пд Турцыі. Даўж. 474 км, пл. бас. 21,2 тыс. км^2. Пачынаецца ў гарах Арменскага Таўра, ніжняе цячэнне — на нізіне Чукурава, упадае ў заліў Іскендэрон Міжземнага м., утварае дэльту. Сярэдні расход вады каля 230 м^3/с. Зімняя паводка. Выкарыстоўваецца на арашэнне. У даліне — г. Джэйхан.

ДЖО́КСАН (Jackson), горад на Пд ЗША, на Прымексіканскай нізіне. Адм. ц. штата Місісіпі. Засн. ў 1822. 196,6 тыс. ж., з прыгарадамі каля 500 тыс. ж. (1990). Вузел чыгунак і аўтадарог. Гандл.-фін. цэнтр с.-г. і нафтагазаздабыўнога раёна. Прам-сць: тэкст., харч., хім., эл.-тэхн. (вытв-сць кабелю, эл.-быт. прылад), аўтамаб. (дэталі і вузлы), сілікатна-керамічная, дрэваапр. і мэблевая. Ун-т. Музеі.

ДЖО́КСАН (Hackson) Джэсі Луіс (8.10.1941, г. Грынвіл, штат Паўд. Караліна, ЗША), негрыцянскі паліт. і грамадскі дзеяч ЗША, прапаведнік. Скончыў Чыкагскую духоўную семінарыю (1968). У 1960-я г. ўдзельнік руху за грамадз. правы неграў, паплечнік М.Л.*Кінга*. У 1971—83 прэзідэнт заснаванай ім арг-цыі «Аб'яднаны народ на службе чалавецтва», мэтай якой было садзейнічаць паляпшэнню эканам. становішча неграў. Сфармуляваў праграму т.зв. вясёлкавай кааліцыі — саюза неграў, лацінаамерыканцаў і індзейцаў, які забяспечваў бы ім магчымасць павышэння свайго сац. статуса ў грамадстве і пашырэння ўдзелу ў паліт. дзейнасці. Першы негрыцянскі палітык, які выстаўляў сваю кандыдатуру на пост прэзідэнта ЗША на выбарах 1984 і 1988.

ДЖО́КСАН (Jackson) Майкл (н. 29.8.1958, г. Гэры, штат Індыяна, ЗША), амерыканскі рок-спявак і кампазітар. Прафес. выступленні пачаў у 1969 у складзе сямейнай групы «Пяцёрка Джэксанаў» (з 1975 наз. «Джэксаны»), першы сольны «хіт» выканаў у 1971 («Павінен быць тут»). З 1979 супрацоўнічаў са студыяй кампазітара і аранжыроўшчыка К.Джонсана. Сярод найб. вядомых альбомаў: «Са сцяны» (1979), «Трылер» (1982), «Дрэнны» (1987), «Небяспечны» (1991), шматлікія пласцінкі-«сінглы», у т.л. «Білі Джын» (1983). Найб. дасягненне Дж. як кампазітара — песня «Мы — гэта свет» (1985, разам з Л.Рычы), у запісе якой удзельнічалі многія зоркі сусв. музыкі. Яго відэа- і канцэртныя выступленні вылучаюцца экспрэсіяй, пластычнасцю, прадуманай харэаграфіяй, уражвальнымі рэжысёрскімі вырашэннямі.

Дз.А.Падбярэзскі.

ДЖО́КСАН (Jackson) Махалія (Мехейлія; 26.10.1911, г. Новы Арлеан, ЗША — 27.1.1972), амерыканская спявачка. З 1928 працавала з роднымі хар. і інстр. групамі, вылучылася пераважна выкананнем негрыцянскіх рэліг. песень і гімнаў (т. зв. «госпел»), а таксама *спірычуэл*. Яе першы запіс створаны ў 1934, найб. поспех набыла яе версія песні-госпел «Уздыміся крыху» (1945). У 1950-я г. шмат выступала на радыё і тэлебачанні, спявала на інаугурацыі Дж.Кенэдзі, у прэстыжных залах, у т.л. «Карнегі-хол», з аркестрам Э.*Элінгтана*, гастраліравала ў Еўропе. Па рэліг. матывах не выконвала блюзы, аднак зазнала ўздзеяння традыцыі іх выканання.

Дз.А.Падбярэзскі.

ДЖО́КСАНВІЛ (Jacksonville), горад на ПдУ ЗША, у штаце Фларыда. Засн. ў 1816. 673 тыс. ж., з прыгарадамі 906,7 тыс. ж. (1994). Порт на р. Сент-Джонс паблізу ўпадзення яе ў Атлантычны ак. Вузел чыгунак і аўтадарог. Гандлёва-фін. цэнтр с.-г. і ляснога раёна. Прам-сць: харчасмакавая (у т.л. вытв-сць цыгарэт, піва), цэлюлозна-папяровая, дрэваапр., хім., паліграф., шкляная. Суднабудаванне, чорная металургія, металаапрацоўка. 2 ун-ты. Маст. галерэя. Ваенная база.

ДЖО́ЛАМ, рака ў Індыі і Пакістане, правы прыток р. Чынаб (бас. Інда). Даўж. 810 км, пл. бас. 55,3 тыс. км^2. Пачынаецца ў хр. Пір-Панджал (Цэнтр. Гімалаі), перасякае Кашмірскую даліну, Паўн. і Зах. Гімалаі, цячэ па раўнінах Пенджаба. Сярэдні расход вады каля 900 м^3/с. Летняя паводка. Ад Дж. адыходзіць сетка арашальных каналаў. Суднаходная ў ніжнім цячэнні. ГЭС. На Дж. — гарады Срынагар (Індыя), Джэлам (Пакістан).

ДЖЭМ (англ. jam), харчовы прадукт, плады ці ягады, згатаваныя ў цукровым сіропе. У адрозненне ад варэння Дж. мае сіроп жэлепадобнай кансістэнцыі і можа працяглы час захоўвацца пры пакаёвай т-ры.

ДЖЭМА́ЛЬ-АД-ДЗІН АЛЬ-АФГАНІ́ Мухамед Сеід (1838, с. Асадабад, каля Кабула — 9.3.1897), мусульманскі рэліг. і паліт. дзеяч, філосаф, пісьменнік, публіцыст. Заснавальнік *панісламізму*. Заклікаў да мадэрнізацыі *ісламу* з мэтай паліт. адраджэння халіфата пад эгідай Асманскай імперыі і вызвалення з-пад еўрап. паліт. і культ. ўплыву. У 1883—86 жыў у Зах. Еўропе. Выдаваў у Парыжы газ. «Надзейная апора». Аўтар твораў на перс. мове «Абвяржэнне матэрыялізму».

«ДЖЭ́МІНІ», «Джэмінай» (Gemini), назва серыі амер. двухмесных касм. караблёў (КК) для палётаў на калязямнай арбіце; праграма іх распрацоўкі і палётаў.

КК «Дж.» складаецца з герметычнага спускальнага апарата, дзе размяшчаюцца 2 касманаўты, і негерметычнага адсека з абсталяваннем і тармазнымі рухавікамі. Мае апаратуру і ракетны рухавік для збліжэння з інш. ляталь-нымі апаратамі на арбіце. Сістэма жыццезабеспячэння разлічана на 14 сут, пасадка прадугледжана толькі на ваду. Усяго па праграме «Дж.» запушчана 12 КК (1964—66; 10 з іх з 2 касманаўтамі на борце). У час палётаў правадзілася манеўраванне і збліжэнне КК («Дж.-6» і «Дж.-7»), стыкоўка з ракетай «Аджэна», выхад касманаўтаў у касм. прастору (Э.*Уайт*, Ю.*Сернан*, М.*Колінз*, Р.*Гордан*,

Схема спускальнага апарата касмічнага карабля «Джэміні»: 1 — герметычная капсула; 2 — крэслы касманаўтаў; 3 — пульт і прыладная дошка; 4 — адсек сістэмы арыентацыі; 5 — кантэйнер з парашутамі; 6 — радыёлакатар для збліжэння на арбіце; 7 — бартавая апаратура і абсталяванне; 8 — цеплаахоўны экран.

Э.*Олдрын*), выпрабаванне сістэм карабля, фатаграфаванне Зямлі, неба і інш. Праграма «Дж.» была падрыхтоўчым этапам праграмы *«Апалон»*.

ДЖЭМС, Джэймс (James) Уільям (11.1.1842, Нью-Йорк — 26.8.1910), амерыканскі філосаф і псіхолаг, адзін з заснавальнікаў *прагматызму*. Брат Г.*Джэймса*. Праф. фізіялогіі і псіхалогіі, потым філасофіі Гарвардскага ун-та (1872—1907). Адзінай рэчаіснасцю абвяшчаў дзейнасць і змест чалавечай свядомасці, якую разумеў як паток непасрэдных адчуванняў і ўражанняў, што ўзнікаюць на аснове бесперапынных нерв. узбуджэнняў. Прапанаваў «прагматычны» крытэрый ісціны, якую атаясамліваў з працаздольнасцю, паспяховасцю і карыснасцю. Паводле Дж., рэліг. перажыванне падобна любому іншаму вопыту, а рэліг. вера — прагматычна апраўдана. Развіў вучэнне аб эмоцыях — адзін з вытокаў *біхевіярызму*.

Тв.: Рус. пер. — Научные основы психологии. СПб., 1902; Прагматизм. СПб., 1910; Вселенная с плюралистической точки зрения. М., 1911.

«ДЖЭНЕРАЛ МОТАРС КАРПАРЭЙШЭН» (General Motors Corporation), аўтамабільны канцэрн ЗША. Адзін з найб. вытворцаў аўтамабіляў у свеце. Засн. ў 1916, адміністрацыя ў г. Дэтройт. Звязана з фін. групай Моргана. Налічвае больш за 150 прадпрыемстваў у ЗША, філіялы, зборачныя цэхі ў 35 краінах свету, у т.л. ў Аўстраліі, Бразіліі, Вялікабрытаніі, Германіі, Мексіцы. Выпускае легкавыя аўтамабілі розных марак («Б'юік», «Кадылак», «Пантыяк», «Олдсмабіл», «Шэўрале»), грузавыя аўтамабілі, аўтобусы, дызельныя лакаматывы і інш. У 1985 «Дж.м.к.» заснавала новую кампанію пад назвай «Сатурн карпарэйшэн», якая выпускае мікралітражныя аўтамабілі.

«ДЖЭНЕРАЛ ЭЛЕКТРЫК КОМПАНІ» (General Electric Company), буйнейшая ў ЗША прамысл. карпарацыя па электроніцы. Засн. ў 1892 шляхам аб'яднання «Эдысан джэнерал электрык компані» і «Томсан-Хаўстан электрык компані». Штаб-кватэра ў г. Скенектады (штат Нью-Йорк). Кантралюецца фін. групай Моргана. Мае філіялы больш як у 50 краінах свету. Звязана з герм. (удзел у канцэрнах «Осрам» і АЭГ) і брыт. (удзел у канцэрне «Асашыэйтэд электрыкал індастрыс») прам-сцю. Прадукцыя карпарацыі ахоплівае амаль усе галіны машынабудавання, электронікі і электратэхн. прам-сці і інш.: турбіны, лакаматывы, станкі, інструменты, тэлекамунікацыйнае, электратэхн. і электрасілавое абсталяванне, ядзерныя рэактары, ракеты, мед. тэхніка, сінт. алмазы, пластмасы, фарбы, электралямпы і інш. У час 2-й сусв. вайны на з-дах «Дж.э.к.» была зроблена атамная бомба.

ДЖЭНІНГС (Jennings) Герберт Спенсер (1868—1947), амерыканскі біёлаг. Замежны чл.-кар. Расійскай АН з 1924. Праф. заалогіі ун-та Дж.Хопкінса ў г.Балтымар. Навук. працы па генетыцы папуляцый і экалогіі жывёл, фізіялогіі размнажэння, спадчыннасці і паводзін прасцейшых і інш. ніжэйшых жывёл.

ДЖЭНКС (Jencks) Чарлз (н. 12.5.1939, г. Балтымар, ЗША), англійскі архітэктар, тэарэтык архітэктуры *постмадэрнізму*. Скончыў Гарвардскі і Лонданскі ун-ты. Аўтар артыкулаў і кніг па пытаннях сучаснай архітэктуры «Значэнне ў архітэктуры» (1969, у сааўт.), «Сучасныя рухі ў архітэктуры» (1973), «Мова архітэктуры постмадэрнізму» (1977), «Архітэктура позняга мадэрнізму» (1980), «Да сімвалісцкай архітэктуры» (1985).

Тв.: Рус. пер. — Язык архитектуры постмодернизма. М., 1985.

ДЖЭНТЛЬМЕ́Н (англ. gentleman літар. высакародны чалавек), 1) чалавек высакароднага паходжання, дваранін (устарэлае). 2) У Вялікабрытаніі і інш. англамоўных краінах — чалавек, які строга прытрымліваецца свецкіх правіл паводзін, а таксама пачцівы зварот да мужчын. 3) Чалавек, які вызначаецца сваёй выхаванасцю ў паводзінах, далікатнасцю і зграбнасцю адзення.

ДЖЭНТЛЬМЕ́НСКАЕ ПАГАДНЕ́ННЕ, гл. ў арт. *Дагавор міжнародны*.

ДЖЭ́НТРЫ (англ. gentry), 1) у Англіі 16—17 ст. сярэдняе і дробнае дваранства, якое здолела прыстасавацца да развіцця капіталізму (асн. частка т. зв. новага дваранства). Гал. сакознік буржуазіі ў час *Англійскіх рэвалюцый 17 стагоддзя*. 2) Пашыранае ў еўрап. навук. л-ры абазначэнне кітайскага феад. саслоўя шэньшы.

ДЖЭНТЫЛЕ́СКІ (Gentileschi) Арацыо (сапр. Л о м і; Lomi; хрышчаны 9.7.1563, г. Піза, Італія — 7.2.1638), італьянскі жывапісец; адзін з прадстаўнікоў італьян. *караваджызму*. Брат і вучань мастака-маньерыста А.Ломі. З 1576 працаваў у Рыме, а таксама ў Генуі, Турыне, Парыжы, з 1626 — у Лондане, пры двары Карла I. Творам Дж. (у якіх выразна адчуваецца ўплыў ранняй творчасці М.Караваджа) уласцівы лірычная сузіральнасць, свабода кампазіцыйных рашэнняў, тонкасць святлоценявых пераходаў і вытанчанасць светлавога каларыту («Св. Цэцылія»; «Благавешчанне», 1621—23; «Лютністка» і інш.).

А.Джэнтылескі. Давід з галавой Галіяфа. Каля 1610.

ДЖЭ́РБА, востраў у Міжземным м., каля берагоў Туніса, у паўд. ч. заліва Габес. Пл. 500 км^2. Паверхня раўнінная, амаль плоская. Вырошчваюць пальмы, аліўкавыя дрэвы. Рыбалоўства. Гал. горад — Джэрба.

ДЖЭ́РМІ (Germi) П'етра (14.9.1914, г. Генуя, Італія — 5.12.1974), італьянскі кінарэжысёр, акцёр, сцэнарыст. Скончыў Эксперым. кінацэнтр у Рыме. Сацыяльна-крытычныя фільмы «Аблудная моладзь» (1947), «У імя закону» (1949, у сав. пракаце «Пад небам Сіцыліі»), «Дарога надзеі» (1950), «Горад абараняецца» (1951), «Машыніст» (1956) і «Бесхарактарны мужчына» (1958, у апошніх сыграў гал. ролі) паставілі Дж. ў лік найб. значных майстроў *неарэалізму*. Карысталіся поспехам яго сатыр. трагікамедыі пра сіцылійскія норавы: «Развод па-італьянску» (1961), «Спакушаная і пакінутая» (1964), «Альфрэда, Альфрэда» (1971) і вясёлая і гарэзлівая камедыя «Серафіна» (1969).

ДЖЭРО́М (Jerome) Джэром Клапка (2.5.1859, г. Уолсал, Вялікабрытанія — 14.6.1927), англійскі пісьменнік. Працаваў клеркам, акцёрам, рэпарцёрам, настаўнікам і інш. З 1892 цалкам прысвяціў сябе літ. дзейнасці. Першы зб. гумарыстычных замалёвак «На сцэне і за кулісамі» (1885). Наступная кніга «Пустыя думкі пустога чалавека» (1886). Сапраўдную папулярнасць Дж. прынесла кн. «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі» (1889). Аўтар кніг «Дзённік аднаго паломніцтва», «Гісторыі, расказаныя пасля вячэры» (абедзве 1891), «Трое на веласіпедзе» (1900), «Назіранні Генры» (1901), аўтабіягр. рамана «Пол Келвер» (1902), рамана «Томі і К°» (1904) і інш., п'ес (найб. вядомая «Жыхар з чацвёртага паверха», 1907). Перавагу аддаваў 2 жанравым формам — гумарыстычнаму эсэ і «падарожжу», у якіх гал. герой — чалавек энергічны і непахісны аптыміст — пастаянна апынаўся ў камічна-абсурдных сітуацыях.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. [Т. 1—2]. СПб., 1992—93. *Е.А.Лявонава.*

ДЖЭРСЕ́ЙСКАЯ ПАРО́ДА буйной рагатай жывёлы, старажытная культурная парода малочнага кірунку. Выведзена ў Вялікабрытаніі (в-аў Джэрсі). Паходзіць ад мясц. жывёлы Нармандыі і Брэтані. Займае першае месца ў свеце па тлустамалочнасці. Гадуюць у многіх краінах Еўропы, у ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Новай Зеландыі і інш.

Быкоў Дж.п. выкарыстоўваюць у скрыжаваннях з каровамі інш. малочных парод для павышэння тлустамалочнасці.

Канстытуцыя жывёлы далікатная, сухая: галава маленькая, лёгкая, шыя доўгая плоская, грудзі вузкія, вымя добра развітое, ногі тонкія, кароткія. Масць светла-бурая, бурая, часам з белымі лапінамі. Жывая маса быкоў 600—700 кг, кароў 360—400 кг. Сярэднегадавы надой 3—3,5 т (рэкордны — 11,2 т), тлустасць малака 5—6%.

ДЖЭ́РСІ (англ. jersey ад назвы в-ва Джэрсі), асновавязаная тканіна (трыкатаж) з шарсцяных, баваўняных, шаўковых ці сінт. нітак; а таксама адзенне з такой тканіны.

ДЖЭ́РСІ-СІ́ЦІ (Jersey City), горад на ПнУ ЗША, зах. прыгарад Нью-Йорка, на правым беразе р. Гудзон, у штаце Нью-Джэрсі. Засн. ў 1630. Каля 230 тыс. ж., з прыгарадамі каля 600 тыс. ж. (1995). Вузел чыгунак і аўтадарог. Марскі порт (частка Нью-Йоркскага партовага комплексу). Прам-сць: нафтаперапр., хім. (выраб мыйных і парфумерна-касметычных сродкаў), эл.-тэхн. і радыёэлектронная, харчасмакавая (у т.л. перапрацоўка кавы), фармацэўтычная, швейная, тэкстыльная. Суднабудаванне. Вытв-сць прамысл. абсталявання. Музеі.

ДЖЭРЫ́Д, Шот-эль-Джэрыд, бяссцёкавая ўпадзіна ў цэнтр. частцы Туніса, на выш. 16 м. Даўж. 120 км. Шыр. 60 км. У час зімовых дажджоў ператвараецца ў мелкае салёнае возера, у сухі час года перасыхае. Вакол Дж. крыніцы прэсных грунтавых вод і артэзіянскія калодзежы з аазісамі.

ДЖЭСПЛІ́Т, горная парода, тое, што *жалезісты кварцыт*.

ДЖЭТЫ́М, горны хрыбет у Цянь-Шані, на Пд ад хр. Тэрскей-Алатау, у Кіргізіі. Даўж. каля 120 км, выш. да 4931 м. Пераважае высакагорны рэльеф. Уздоўж паўд. падножжа цячэ р. Нарын. На схілах стэпавая, лугава-стэпавая і лугавая расліннасць. Ва ўсх. частцы — ледавікі.



Карова **джэрсейскай пароды**.

ДЖЭ́ФЕРСАН (Jefferson) Томас (11.4.1741, Шадвел, штат Віргінія, ЗША — 4.7.1826), дзеяч амерыканскага нац.-вызв. руху, адзін з заснавальнікаў ЗША, паліт. філосаф, асветнік. Адвакат, плантатар. Член заканад. сходу брыт. калоніі Віргінія (1769—74), выступаў за вызваленне неграў-рабоў. У *вайну за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83* дэп. 2-га Кантынент. кангрэса (1775 — 76, 1783), распрацаваў праект *Дэкларацыі незалежнасці 1776* (у ёй значнае месца адвёў канцэпцыі правоў чалавека); член заканад. сходу (1776—79) і губернатар штата Віргінія (1779—82), падрыхтаваў «Статут аб рэлігійнай свабодзе». Пасланнік ЗША у Францыі (1785—89). Лідэр (разам з П.Генры) *антыфедэралістаў*. Ініцыіраваў прыняцце кангрэсам ЗША закону аб забароне рабства на ПнЗ краіны (1787). Дзярж. сакратар ЗША у 1-м урадзе Дж.Вашынгтона (1790—93). Віцэ-прэзідэнт (1797—1801) і прэзідэнт ЗША (1801—09). У часы прэзідэнцтва Дж. скасаваны антыдэмакр. законы папярэдняга ўрада Дж.Адамса аб іншаземцах і здрадзе, скарочаны ўзбр. сілы і дзярж. апарат, набыта Луізіяна (1803), установлены дыпламат. адносіны з Расіяй (1808—09) і інш. Садзейнічаў развіццю архітэктуры і сістэмы адукацыі ў ЗША, у т.л. буд-ву Віргінскага ун-та ў г. Шарлатсвіл (1817—26).

Т.Джэферсан.

Літ.: Печатнов В.О. Гамильтон и Джефферсон. М., 1984; Согрин В.В. Джефферсон: Человек, мыслитель, политик. М., 1989.

ДЗ, графема ў бел. алфавіце для абазначэння асобнага складанага гука. Дыграф, утвораны з літар «д» і «з», перадае афрыкату «дз». У помніках старабел. пісьменства адзначаецца з 16 ст. («дедзичъ», «жаръдзье», «медзь»). Як сродак паказу *дзекання* выступаў спарадычна, пераважна ў запазычаных словах. Асобнае вымаўленне «д» і «з» («д-зякуй», «д-зень»), а таксама вымаўленне «дз» як мяккага «д» з'яўляецца парушэннем нормы бел. літ. вымаўлення. У якасці 2 асобных гукаў спалучэнне «дз» вымаўляецца толькі ў словах тыпу «падзагаловак», «падзямелле», дзе «д» — канцавы гук прыстаўкі, а «з» — пачатковы гук кораня («пад-земны»). *М.Р.Прыгодзіч.*

ДЗА́БХАН, рака на З Манголіі. Даўж. 808 км, пл. бас. 71,2 тыс. км^2. Пачынаецца ў гарах Хангай, сярэдняе цячэнне — па шырокай міжгорнай упадзіне, ніжняе — па пустынях Катлавіны Вял. азёр, упадае некалькімі рукавамі ў воз. Айраг-Нур. Сярэдні расход вады на выхадзе з гор 60 м^3/с. Жыўленне снегавадажджавое. Выкарыстоўваецца для арашэння.

ДЗАСАТЫ́Н-ЭЛІСУ́Н, пясчаная пустыня на ПнЗ Кітая (Сіньцзян), у цэнтр. ч. Джунгарскай раўніны. Пл. каля 45 тыс. км^2, з якіх каля 38 тыс. км^2 паўзамацаваныя градавыя і барханныя пяскі, астатняя ч. — такыры і пясчана-галечныя раўніны. Грады пераважна мерыдыянальнага напрамку, выш. да 30 м (у паўн. ч. месцамі да 80—100 м), са стромкімі ўсх. схіламі і больш спусцістымі заходнімі. На барханах рэдкія зараснікі саксаулу, палыну, вярблюджай калючкі, на такырах — тамарыску. Выкарыстоўваецца як паша для авечак і вярблюдаў.

ДЗАЦЭНІ́ДЗЕ Георгій Самсонавіч (23.2.1910, г. Кутаісі, Грузія — 5.5.1976), грузінскі геолаг. Акад. АН Груз. ССР (1955), акад. АН СССР (1968). Скончыў Тбіліскі ун-т (1929). З 1933 у пед. ін-це Кутаісі. З 1934 у Тбіліскім ун-це (у 1958—59 рэктар). У 1955—58 віцэ-прэзідэнт АН Груз. ССР. Навук. працы прысвечаны праблемам палеавулканалогіі, сувязі магматызму з тэктонікай, вулканагенна асадкавага літагенезу.

Тв.: Влияние вулканизма на образование осадков. М., 1965.

ДЗВЕ́Я, рака, гл. *Змейка*.

ДЗВІН, Вастан Дзвін, рамесна-гандл. горад, цэнтр транзітнага гандлю Арменіі ў 4—13 ст. (за 35 км на Пд ад Ерэвана). У 330-я г. арм. цары *Аршакіды* пабудавалі тут крэпасць і перанеслі туды сваю рэзідэнцыю. Пасля падзення Арм. царства ў 428 Дз. стаў рэзідэнцыяй перс. правіцеляў Арменіі. З 640 — цэнтрам араб. эмірата — Армінія. У 1236 разбураны манголамі. Раскопкі Дз. праводзяцца з 1937. У крэпасці адкрыты руіны палацаў, жылыя дамы і ганчарныя майстэрні 10—13 ст. У цэнтры горада — рэшткі сабора (перабудаваны ў 7 ст.), палац каталікоса (5 ст.), будынак вял. караван-сарая і інш.

ДЗВІНАСА́, рака ў Лагойскім і Вілейскім р-нах Мінскай вобл., левы прыток р. Вілія. Даўж. 54 км. Пл. вадазбору 614 км^2. Пачынаецца каля в. Задворнікі Лагойскага р-на, цячэ ў межах Мінскага ўзв. У верхнім цячэнні наз. Сытніца. Асн. прытокі: Малка, Рудаўка, Балавец, Вейнка (справа), Дзвонка (злева). Пойма двухбаковая, забалочаная (асабліва ў ніжнім цячэнні), шыр. 100—150 м. Рэчышча ў верхнім цячэнні на працягу 3,3 км каналізаванае. Берагі стромкія. На рацэ *Плешчаніцкае вадасховішча*, сажалка. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. каналаў.

ДЗВІ́НСКАЯ ВАЕ́ННАЯ АКРУ́ГА, ваенна-тэр. адзінка ў Расіі ў час 1-й сусв. вайны. Створана ў ліп. 1914 замест скасаванай Віленскай ваен. акругі; тылавы раён Паўн.-Зах., з 1915 — Паўн. франтоў. Тэр. акругі ў выніку ваен. дзеянняў неаднаразова мянялася, у 1917 уключала Віцебскую, Пскоўскую і частку Ліф-

ляндскай губ. Штаб дыслацыраваўся ў Вільні, а пасля яе здачы ў жн. 1915 — у Віцебску. Камандаванне акругі займалася камплектаваннем і размяшчэннем вайск. часцей, нарыхтоўкай усяго неабходнага для дзеючай арміі, эвакуацыяй параненых і цывільнага насельніцтва, загадвала ўсімі ваен. ўстановамі, займалася пытаннямі цэнзуры і контрразведкі і інш. Штаб акругі расфарміраваны вясною 1918. *М.М.Смальянінаў.*

ДЗВІ́НСКАЯ ГУБА́, Дзвінскі заліў, заліў каля паўд.-ўсх. ч. Белага м. Даўж. 93 км, шыр. каля ўваходу 130 км, глыб. ад 15—22 да 120 м (на ПнЗ). Зімой замярзае. Летам у Дз.г. адзначаецца найб. высокая т-ра вады ў Белым м. (да 12 °С). Прылівы паўсутачныя (да 1,4 м). Упадае р. Паўн. Дзвіна, у дэльце якой парты Архангельск і Северадзвінск.

ДЗВІ́НСКАЯ ЗЯМЛЯ́, гістарычная вобласць на Русі ў бас. Паўн. Дзвіны ў 11—15 ст. Уключала ч. сучаснай Архангельскай вобл. на Пн ад Волга-Паўночнадзвінскага водападзела — «валокі» (наз. таксама Завалочча). Насельніцтва займалася земляробствам, пушным і рыбным промысламі. З 11 ст. ўладанне Ноўгарада. У 14—15 ст. за валоданне Дз.з. з Ноўгарадам сапернічала Масква.

У 1478 далучана да Маскоўскага вял. княства.

ДЗВІ́ХІСЦІН ТЭО́РЫЯ, сярэдневяковае вучэнне пра аўтаномнасць ісцін філасофіі (г. зн. рацыянальнага пазнання) і тэалогіі, якія могуць уступаць у супярэчнасць адна з адной. Узнікла ў 12—13 ст., звязана з пранікненнем арыстоцелізму ў сярэдневяковую культуру. Узыходзіць да Ібн Рушда і выразна сфармулявана ў *авераізме*. Ібн Рушд, прадстаўнікі наміналізму І.Дунс Скот, У.Окам сцвярджалі, што філасофія мае свае ўласныя, незалежныя ад багаслоўя прынцыпы, якія могуць супярэчыць догмам тэалогіі. Дз.і.т. развіваў пачынальнік англ. матэрыялізму Ф.Бэкан, які патрабаваў поўнага неўмяшання рэлігіі ў сферу навук. пазнання. Гэта тэорыя неаднаразова асуджалася царквой. У 1512 Латэранскі сабор паклаў канец дыскусіям пра «дзве ісціны», абвясціўшы прынцып «ісціна ісціне не супярэчыць». Вальнадумства эпохі Адраджэння паступова адыходзіць ад кампраміснай пазіцыі сярэдневяковых авераістаў, замяняе Дз.і.т. вучэннем пра «дзве кнігі» — Прыроды і Пісання, што адкрыты чалавечаму пазнанню: толькі ў «кнізе прыроды» чалавек набывае ісціну навукі і філасофіі, за Пісаннем застаецца функцыя рэліг.-маральных павучанняў (Т.Кампанела, Г.Галілей).

ДЗЕ́ВА, Панна (лац. Virgo), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. Самая яркая зорка — Спіка (L Дз., 1-й візуальнай *зорнай велічыні*) разам з 3 менш яркімі зоркамі ўтварае фігуру ромба, бачную простым вокам. У сузор'і 95 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні; выяўлена скопішча (2,5 тыс.) галактык спіральнай структуры, сярод якіх размешчана магутная крыніца радыёвыпрамянення — радыёгалактыка Дз.-А. У Дз. знаходзіцца пункт асенняга *раўнадзенства*. На тэр. Беларусі сузор'е відаць у канцы зімы і вясною.

ДЗЕ́ВА, ланцуг горных масіваў на ПнЗ в-ва Хонсю, у Японіі. Даўж. каля 225 км. Пераважная выш. 200—800 м, найб. 2230 м (вулкан Цёкай). Масівы складзены з крышт. і асадкавых парод. Хвойныя лясы. Лесараспрацоўкі. У міжгорных паніжэннях — радовішчы нафты і газу.

ДЗЕ́ВЕР, мужаў брат.

ДЗЕ́ВІНСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Аршанскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лучоса, за 30 км на Пн ад г. Орша. Пл. 2 км^2, даўж. 5,1 км, найб. шыр. 600 м, найб. глыб. 9,6 м, даўж. берагавой лініі каля 14 км. Пл. вадазбору 26,9 км^2. Схілы катлавіны выш. 5—10 м, пад лугам ці разараныя, асобныя ўчасткі параслі лесам. Берагі выш. 0,3—0,4 м, пад хмызняком. Падводная ч. катлавіны ўскладняецца мелямі і ўпадзінамі. Востраў пл. 0,2 га. Прыбярэжную зону да глыб. 3 м высцілаюць пяскі, глыбакаводную — сапрапелі і глеі. Надводная расліннасць утварае паласу шыр. да 25 м. У возера ўпадаюць 9 ручаёў і каналаў, на Пн выцякае р. Серакаратнянка. Уваходзіць у зону адпачынку Дзевінскае.

ДЗЕВЯ́ТАГА СТУ́ДЗЕНЯ 1905, гл. *«Крывавая нядзеля»*.

ДЗЕВЯТА́ЕЎ Міхаіл Пятровіч (н. 8.7.1917, г.п. Тарбеева, Мардовія), Герой Сав. Саюза (15.8.1957). Скончыў Чкалаўскую ваен. авіяц. школу лётчыкаў (1940). У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 у дзеючай арміі. Камандзір звяна 104-га знішчальнага авіяпалка ст. лейт. Дз. у паветр. баях збіў некалькі варожых самалётаў. 13.7.1944 у няроўным паветр. баі збіты, трапіў у палон. 8.2.1945 група сав. ваеннапалонных (10 чал.) з канцлагера на воз. Узедом (Германія) захапіла на ням. аэрадроме бамбардзіроўшчык. Самалёт, які пілатаваў Дз., праз 2 гадз быў у размяшчэнні сав. войск. З 1945 у запасе, з 1946 працаваў у Казанскім рачным порце капітанам, капітанам-настаўнікам пасаж. суднаў на падводных крылах.

ДЗЕВЯ́ТАЎ Аркадзь Сяргеевіч (н. 11.3.1923, г. Харанор Чыцінскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне пладаводства. Д-р с.-г. н. (1962), праф. (1965). Скончыў Новасібірскі с.-г. ін-т (1946). З 1957 у Бел. НДІ садоўніцтва. Навук. працы па біялогіі і агратэхніцы пладовых раслін, вывучэнні архітэктонікі каранёвай сістэмы, рэсурсу плоданашэння высакашчыльных садоў, праектаванні і арганізацыі прамысл. пладаводства. Чл. Нью-Йоркскай АН (1994).

Тв.: Проектирование плодоводства. Мн., 1967; Повышение качества плодовых деревьев и урожайности садов. 2 изд. Мн., 1985; Как правильно формировать и обрезать плодовые деревья и ягодные кусты. Мн., 1995.

ДЗЕВЯ́ТАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ КП(б)Б, гл. *Чацвёрты з'езд КП(б)Б.*

ДЗЕВЯ́ТКАВІЧЫ, мястэчка ў Слонімскім павеце ВКЛ, гл. ў арт. *Новыя Дзевяткавічы.*

ДЗЕВЯ́ТКАЎ Мікалай Дзмітрыевіч (н. 11.4.1907, г. Волагда, Расія), расійскі вучоны ў галіне электронікі. Акад. Расійскай АН (1968, чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1931). Працаваў у Маскоўскім фіз.-тэхн. ін-це, Ін-це радыётэхнікі і электронікі АН СССР, інш. НДІ, навук. ВА «Выток». Навук. працы па вывучэнні газавага разраду, стварэнні газаразрадных прылад для аховы ліній сувязі, прылад і прыстасаванняў ЗВЧ-дыяпазону, мед. электроніцы. Гал. рэдактар час. «Радиотехника и электроника». Ленінская прэмія 1965. Дзярж. прэмія СССР 1949.

М.Дз.**Дзевяткаў**.

Тв.: Разрядники для защиты линий слабого тока // Электричество. 1931. № 22; Лазеры в клинической медицине. М., 1981; Миллиметровые волны и их роль в процессах жизнедеятельности. М., 1991 (разам з М.Б.Голантам, А.У.Бецкім).

ДЗЕВЯТНА́ЦЦАТАЯ УСЕСАЮ́ЗНАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ КПСС. Адбылася 28.6—1.7.1988 у Маскве; 4991 дэлегат прадстаўляў 18,9 млн. членаў партыі. Парадак дня: аб ходзе рэалізацыі рашэнняў XXVII з'езда КПСС, асн. выніках 1-й пал. 12-й пяцігодкі і задачах парт. арг-цый па паглыбленні працэсу перабудовы; аб захадах па далейшай дэ-



Сузор'е **Дзева**.

макратызацыі жыцця партыі і грамадства. Канферэнцыя прыняла шэраг рэзалюцый, паводле якіх гал. мэтамі перабудовы абвешчаны змена паліт. структуры сав. грамадства і перадача ўсёй улады ад КПСС Саветам нар. дэпутатаў; прапанавана (пазней унесена ў Канстытуцыю СССР) новая (больш складаная) структура з'езда нар. дэпутатаў і Вярх. Савета СССР; парт. арг-цыі зарыентаваны на больш паслядоўнае выкараненне бюракратызму і пашырэнне галоснасці; у нац. палітыцы прызнана неабходным актывізаваць развіццё самастойнасці саюзных рэспублік і аўтаномій. *І.Ф.Раманоўскі.*

ДЗЕВЯТНАЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 15—18.2.1949 у Мінску. Прысутнічала 787 дэлегатаў з рашаючым і 129 з дарадчым голасам ад 110 206 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КП(б)Б (М.І.Гусараў), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (В.Я.Сядых); выбары кіруючых органаў КП(б)Б. З'езд ухваліў паліт. лінію і практычную дзейнасць ЦК, падвёў вынікі арганізатарскай работы партыі ў Вял. Айч. вайну, прааналізаваў ход аднаўлення і развіцця нар. гаспадаркі рэспублікі. Шмат увагі аддавалася ідэалаг. рабоце, барацьбе з праявамі бурж. ідэалогіі, у т.л. з нізкапаклонствам перад загранічай. З'езд падкрэсліў, што найвялікшая задача КП(б)Б і ўсіх працоўных рэспублікі — датэрміновае выкананне 4-й пяцігодкі; намеціў мерапрыемствы па паляпшэнні парт. кіраўніцтва аднаўленнем і развіццём нар. гаспадаркі. Выбраў ЦК КП(б)Б з 83 чл. і 48 канд. у чл., Рэвіз. камісію КП(б)Б з 29 чл.

Літ.: Гусараў М.І. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі на XIX з'ездзе КП(б)Б. Мн., 1949; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 4. 1945—1955. Мн., 1986. *А.І.Яфімчык.*

ДЗЕВЯ́ТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 8—12.12.1925 у Мінску. Прысутнічала 247 дэлегатаў з рашаючым і 161 з дарадчым голасам ад 15 075 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КП(б)Б (А.І.Крыніцкі), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (А.А.Чарнушэвіч), ЦКК КП(б)Б (В.П.Грузель); даклады ЦК РКП(б) (І.І.Скварцоў-Сцяпанаў), ЦКК РКП(б) (А.А.Сольц); аб гасп. будаўніцтве (І.А.Адамовіч); аб рабоце прафсаюзаў (М.Е.Ендакоў); аб рабоце сярод моладзі (М.М.Галадзед); аб Чырв. Арміі (С.М.Кажэўнікаў); парт.-арганізац. пытанне; выбары. З'езд ухваліў дзейнасць ЦК, ЦКК і рашэнні XIV канферэнцыі РКП(б), паліт. лінію і арганізац. работу ЦК КП(б)Б, тэзісы Палітбюро ЦК РКП(б) па гасп. будаўніцтве. У рашэннях з'езда па пытаннях сацыяліст. індустрыялізацыі прасочвалася паступовае наступленне на нэп. Адобрыў тэзісы ЦК РКП(б) да XIV з'езда ВКП(б) і намеціў меры па іх выкананні. Абмеркаваў праект Статута РКП(б) і прапанаваў унесці ў яго асобныя змены і дадаткі. Ухваліў новы адм.-тэр. падзел рэспублікі. Усе канферэнцыі, пачынаючы з VI Паўн.-Зах. абласной канферэнцыі РКП(б), якая аб'явіла сябе *Першым з'ездам КП(б)Б*, рашыў лічыць з'ездамі КП(б)Б. Выбраў ЦК КП(б)Б з 43 чл. і 20 канд. у чл., ЦКК КП(б)Б з 18 чл. і 7 канд. у чл., дэлегатаў на XIV з'езд ВКП(б).

Літ.: Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. 1918—1927. Мн., 1983. *А.І.Яфімчык.*

ДЗЕВЯ́ТЫ УСЕБЕЛАРУ́СКІ З'ЕЗД САВЕ́ТАЎ рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Адбыўся 8—15.5.1929 у Мінску. Прысутнічала 559 дэлегатаў з рашаючым і 168 з дарадчым голасам. Парадак дня: справаздача ўрада БССР (М.М.Галадзед); пяцігадовы план развіцця нар. гаспадаркі і культуры БССР (М.М.Карклін, С.Б.Карп, П.М.Рачыцкі, А.В.Баліцкі); аб становішчы Чырв. Арміі (А.І.Ягораў); выбары ЦВК БССР; выбары ад БССР членаў Савета нацыянальнасцей ЦВК СССР. З'езд адзначыў дасягненні БССР у *індустрыялізацыі* і прамысл. буд-ве, павелічэнне ўдзельнай вагі прамысл. прадукцыі ўсёй гаспадаркі, павышэнне культ. ўзроўню насельніцтва, ухваліў захады па рацыяналізацыі і скарачэнні дзярж. апарату. Выконваючы ўказанні урада СССР, з'езд паставіў задачу сацыяліст. рэканструкцыі і *калектывізацыі* сял. гаспадарак, вытв. іх кааперавання, узмацнення і пашырэння саўгасаў пры ўсямерным стымуляванні ўздыму бядняцка-серадняцкага сектара. З'езд адобрыў распрацаваны Дзяржпланам і зацверджаны Саўнаркомам БССР план развіцця нар. гаспадаркі і культ. будаўніцва рэспублікі на 1928—32, адзначыў неабходнасць рашучага сацыяліст. наступу на капіталіст. элементы горада і вёскі. Пэўная ўвага была звернута на працяг палітыкі *беларусізацыі* больш хуткімі тэмпамі. Выбраў ЦВК БССР з 254 чл. і 88 кандыдатаў. У Савет Нацыянальнасцей ЦВК СССР ад рэспублікі было абрана 5 чл. і 2 кандыдаты. Старшынёй ЦВК БССР перавыбраны А.Р.Чарвякоў, старшынёй СНК БССР — Галадзед.

Літ.: Дзевяты Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Стэнагр. справаздача. Мн., 1929; Пастановы IX Усебеларускага з'езду Саветаў і I сесіі ЦВК БССР IX склікання. Мн., 1929. *М.П.Касцюк.*

ДЗЕВЯ́ТЫХ Рыгор Рыгоравіч (н. 1.12.1918, в. Бараноўшчына Кіраўскай вобл., Расія), расійскі хімік-неарганік. Акад. Рас. АН (1974). Герой Сац. Працы (1989). Скончыў Горкаўскі ун-т (1941) і працаваў у ім. З 1973 у Ін-це хіміі АН СССР (г. Ніжні Ноўгарад), з 1988 дырэктар ін-та хіміі высакачыстых рэчываў Рас. АН. Навук. працы па неарган. і аналіт. хіміі высакачыстых рэчываў, праблемах атрымання высакачыстых матэрыялаў. Распрацаваў метады глыбокай ачысткі лятучых неарган. гідрыдаў, хларыдаў і металлаарган. злучэнняў. Ленінская прэмія 1986.

Тв.: Высокочистые тугоплавкие и редкие металлы. М., 1993 (разам з Г.С.Бурханавым).

Літ.: Г.Г.Девятых. М., 1993.

ДЗЕГЦЯРО́Ў Васіль Аляксеевіч (2.1.1880, г. Тула, Расія — 16.1.1949), савецкі канструктар стралковай зброі. Ген.-маёр інжынерна-артыл. службы (1940), д-р тэхн. н. (1940). Герой Сац. Працы (1940). З 1931 нач. праектна-канструктарскага бюро аўтам. стралковай зброі. У 1920—30-я г. канструяваў ручны, авіяц., танкавы і буйнакаліберны *кулямёты*, *пісталет-кулямёт*. У гады Вял. Айч. вайны 1941—45 стварыў *процітанкавае ружжо* і новы ручны кулямёт. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942, 1944, 1949.

Літ.: Нагаев Г.Д. Русские оружейники. М., 1966.

ДЗЕГЦЯРО́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бярозаўка, за 6 км на Пн ад г. Глыбокае. Пл. 0,2 км^2, даўж. 620 м, найб. шыр. 200 м, даўж. берагавой лініі больш за 1,3 км. Схілы катлавіны выш. да 5 м, пераважна разараныя. Выцякае ручай у воз. Шубніцкае.

Р.Р.Дзевятых.

В.А.Дзегцяроў.

ДЗЕ́ДЗІК Аляксандр Аляксандравіч (н. 19.1.1945, Ташкент), спявак (драм. тэнар). Беларус. Засл. арт. Беларусі (1977), нар. арт. Расіі (1983). Вучыўся ў Бел. і Адэскай кансерваторыях, скончыў Новасібірскую кансерваторыю (1970). З 1971 саліст Чэлябінскага, з 1974 — Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1979 — Марыінскага (С.-Пецярбург) т-ра оперы і балета. Валодае голасам вял. дыяпазону, прыгожага мяккага тэмбру, высокай выканальніцкай культурай.

Сярод партый: Джардана Бруна («Джардана Бруна» С.Картэса), Раман («Сівая легенда» Дз.Смольскага), Ёнтэк («Галька» С.Манюшкі), Самазванец («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Герман, Роберт («Пікавая дама», «Іаланта» П.Чайкоўскага), Турыду («Сельскі гонар» П.Масканьі), Пінкертон, Каварадосі («Чыо-Чыо-сан», «Тоска» Дж.Пучыні), Дон Карлас, Манрыка («Дон Карлас», «Трубадур» Дж.Вердзі), Хазэ («Кармэн» Ж.Бізэ). Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя Глінкі (1973), Міжнар. конкурсу імя Чайкоўскага (1974). *Т.Г.Мдывані.*

ДЗЕ́ДЗІЛАВІЧЫ, гарадзішча 1—4 ст. і паселішча 6—8 ст. каля в. Дзедзілавічы

Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры* ўмацавана 2 валамі і 2 равамі; знойдзены абломкі слоікавых гаршкоў, гліняныя прасліцы, жал. сякерападобная прылада. На паселішчы *банцараўскай культуры* выяўлены рэшткі 54 пабудоў зрубнай і слупавой канструкцый. Жытлы мелі печы-каменкі, агнішчы; знойдзены ляпны гладкасценны посуд, жал. прылады працы, бронзавыя ўпрыгожанні, гліняныя прасліцы, жал. коп'і, шпоры.

А.Дзедзік у ролі Самазванца.

ДЗЕ́ДКАВА БАЛО́ТА, на У Столінскага р-на Брэсцкай вобл., у вадазборы р. Маства. Нізінная тыпу. Асобныя часткі наз. Верхлешнае, Ніўскае, Сплаўное, Лістоўніца, Красныя Бярозкі. Пл. 9,6 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 7,7 тыс. га. Глыб. торфу да 1,8 м, сярэдняя 1,1 м. Балота часткова асушана, асушаная ч. пад сенажаццю. На неасушаных землях пераважае злакава-, разнатраўна- і гіпнава-асаковая расліннасць. Пясчаныя грады пад разнатраўем, лесам з бярозы і хвоі.

ДЗЕ́ЕВА Вера Паўлаўна (н. 10.8.1926, в. Горкі Цвярской вобл., Расія), бел. фізіёлаг раслін. Д-р біял. н. (1974), праф. (1990). Скончыла Маскоўскую с.-г. акадэмію (1949). З 1961 у Ін-це эксперым. батанікі АН Беларусі. Навук. працы па вывучэнні фізіёлага-біяхім. асноў накіраванай рэгуляцыі росту і развіцця раслін з дапамогай фізіялагічна актыўных рэчываў (гербіцыдаў, рэтардантаў, стымулятараў).

Тв.: Физиология устойчивости сортов растений к гербицидам и ретардантам. Мн., 1976 (разам з З.І.Шэлег); Ретарданты — регуляторы роста растений. Мн., 1980; Избирательное действие химических регуляторов роста на растения: Физиол. основы. МН., 1988 (разам з З.І.Шэлег і Н.В.Санько).

ДЗЕЕПРЫМЕ́ТНІК, неспрагальная дзеяслоўная форма з асаблівасцямі *дзеяслова* і *прыметніка*. Абазначае дзеянне як прыкмету або ўласцівасць прадмета, што выяўляюцца ў часе. У сучаснай бел. мове Дз. захоўвае дзеяслоўнае *кіраванне*, мае формы незакончанага і закончанага трывання («сушаны», «высушаны»), цяперашняга і прошлага часу («утвараючая», «высахлая»), залежнага і незалежнага стану («засеянае», «засеяўшае»), а таксама роду, ліку і склону, якія выражаюцца тымі самымі грамат. сродкамі (канчаткамі), што і ў прыметніках. Дз. цяперашняга часу ўтвараюцца суфіксамі «-уч-(-юч-)», «-ач-(-яч-)» і «-ом-(-ем-)», «-ім-(-ым-)»; прошлага часу — суфіксамі «-ўш-», «-ш-», «-л-», «-н-(-ен-, -ан-, -ян-)» і «-т-». Яны могуць мець поўную і кароткую форму («збудаваны» — «збудован»).

Літ.: Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове. Мн., 1968. С. 54—61; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *П.П.Шуба.*

ДЗЕЕПРЫСЛО́ЎЕ, неспрагальная дзеяслоўная форма з асаблівасцямі *дзеяслова* і *прыслоўя*. Мае значэнне дадатковага, пабочнага дзеяння або акалічнасці спосабу дзеяння (у ролі выказніка ўжываецца толькі ў асобных гаворках: «Ён быў паехаўшы»). У бел. літ. мове захоўвае дзеяслоўнае *кіраванне*, мае формы незакончанага і закончанага трывання («чытаючы» — «прачытаўшы»), зваротную і незваротную формы («бялеючыся» — «бялеючы»). Форма незакончанага трывання ўтвараецца ад асноў цяперашняга часу суфіксамі «-учы (-ючы)», «-ачы (-ячы)» («несучы», «баючыся», «чытаючы»; «лежачы», «гледзячы»); форма закончанага трывання — ад асноў прошлага часу суфіксамі «-ўшы», «-шы» («зрабіўшы», «прагуляўшы», «высахшы»). У сказе Дз. павінна адносіцца да таго самага суб'екта, што і дзеяслоў-выказнік. Разам з паясняльнымі словамі ўтварае дзеепрыслоўнае словазлучэнне, якое ў сказе ўжываецца як *акалічнасць* і звычайна адасабляецца.

Літ.: Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове. Мн., 1968. С. 61—65; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *П.П.Шуба.*

ДЗЕ́ЖЫЦ Валянцін Канстанцінавіч (9.3.1904, Хельсінкі — 29.12.1964), бел. жывапісец і педагог. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1926), Вышэйшы маст.-тэхн. ін-т у Ленінградзе (1930). Выкладаў у Віцебску ў маст. вучылішчы (1931—41) і пед. ін-це (1948—64). Працаваў пераважна ў жанры пейзажа. Сярод твораў: «Сустрэчны», «Дэпо» (абодва 1932), «Аднаўленне моста ў Віцебску» (1935), «Горад зімой» (1937), «Зімовы пейзаж», «Апошнія пешаходы» (абодва 1946), «9 студзеня» (1947), «Надыход вясны», «Паводка» (абодва 1956), «На Віцебскай прыстані», «Раніца на Віцьбе» (абодва 1958), «Адліга», «Сакавік» (абодва 1960), «Лес — Віцебску» (1961) і інш.

ДЗЕ́ЙНАЕ ЗНАЧЭ́ННЕ, эфектыўнае значэнне, сярэднеквадратычнае за перыяд значэнне перыядычнай эл. велічыні (сілы току, напружання і інш.). Напр., Дз.з. сілы пераменнага току вызначаецца цеплавым дзеяннем току (*Джоўля—Ленца закон* захоўвае свой від, калі пад сілай пераменнага току разумеюць яго Дз.з.). Для велічынь, якія змяняюцца па сінусаідальным законе, Дз.з. ў $\sqrt{2}$ разоў меншае за амплітуду (найб. значэнне). У электратэхніцы Дз.з. напружання, электрарухальнай сілы і сілы току запісваюць без якіх-н. адзнак (усе амперметры і вальтметры вымяраюць Дз.з. току і напружання), напр., калі ў эл. сетцы напружанне 220 В, то менавіта 220 В — Дз.з. напружання, а яго амплітуднае значэнне (двойчы за перыяд) роўнае 220 $\sqrt{2}$ В.

ДЗЕ́ЙНАСЦЬ, спецыфічна чалавечая форма адносін да навакольнага свету, змест якой складае яго мэтазгоднае змяненне і пераўтварэнне ў інтарэсах людзей; умова існавання грамадства. Усякая дзейнасць уключае мэту, сродак, вынік і сам працэс. Гісторыя грамадства, матэрыяльнай і духоўнай культуры чалавецтва — гэта працэс рэалізацыі дзейнатворчых адносін чалавека да навакольнага свету, які выражаецца ў пабудове новых спосабаў і праграм дзейнасці (пераход ад палявання і рыбалоўства да земляробства і жывёлагадоўлі, ад рамёстваў і мануфактуры да буйной машыннай вытв-сці, ад індустр. грамадства да постіндустрыяльнага, да навук.-тэхн. рэвалюцыі). Існуюць разнастайныя класіфікацыі тыпаў і форм Дз.: духоўная, матэрыяльная, вытворчая, працоўная, пазнавальная, прадпрымальніцкая, палітычная і г.д. Асаблівай формай прадукцыйнай Дз. з'яўляецца *творчасць*. Пытанне аб адносінах Дз. і асобы вырашаецца як частка больш шырокай праблемы чалавека (гл. таксама *Дзеянне*, *Дзеянне сацыяльнае*, *Практыка*).

Літ.: Суходольский Г.В. Основы психологической теории деятельности. Л., 1988; Социально-философские проблемы производства и применения научных знаний. Мн., 1992. *С.Ф.Дубянецкі.*

ДЗЕ́ЙНІК, галоўны член двухсастаўнога *сказа*, што абазначае прадмет, прыкмета якога сцвярджаецца або адмаўляецца ў *выказніку*. Разам з выказнікам складае прэдыкатыўную аснову двухсастаўнога сказа. Можа абазначаць чалавека, жывую істоту, неадушаўлёны прадмет, з'яву прыроды, апрадмечанае дзеянне, адцягненае паняцце. Выражаецца назоўнікам і інш. часцінамі мовы, якія набываюць у кантэксце прадметнае значэнне (субстантывіруюцца), а таксама займеннікам, інфінітывам і словазлучэннямі розных тыпаў: «**Маладыя** любяць дружыць з дарослымі», «**Іншы** скажа — проста ў сук улепіць», «**Стаць за лесніка** не ў яго натуры», «Над рэчкай праляцела **пяць качак**».

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 2. Мн., 1986.

ДЗЁЙНЫ СЛОЙ ГЛЕ́БЫ, верхні гарызонт трапічных і субтрапічных глеб, развітых на фералітнай кары выветрывання. Пад непасрэдным уздзеяннем каранёў раслін становіцца аднародным паводле саставу і марфалогіі, набывае буры колер і глебавую структуру.

ДЗЁЙНЫХ МАС ЗАКО́Н, вызначае суадносіны паміж канцэнтрацыямі прадуктаў рэакцыі і зыходных рэчываў у стане *раўнавагі хімічнай*; адзін з асн. законаў фіз. хіміі. Адкрыты ў 1864—67 нарвежскімі вучонымі К.Гульдбергам і П.Вааге, якія назвалі «дзейнай масай» рэчыва — колькасць яго ў адзінцы аб'ёму (канцэнтрацыю), адсюль назва.

Паводле Дз.м.з. пры нязменнай т-ры скорасць элементарнай гамагеннай рэакцыі прама прапарцыянальная здабытку канцэнтрацыі рэагуючых рэчываў у ступенях, роўных стэхіяметрычным каэфіцыентам гэтых рэчываў ва ўраўненні хім. рэакцыі (гл. *Ураўненні хімічныя*). Дз.м.з. карыстаюцца пры разліках у хім. кінетыцы і тэрмадынаміцы.

ДЗЁЙСНЫ ТА́НЕЦ, танец, які ўвасабляе развіццё дзеяння балетнага спектакля; гал. выразны сродак сюжэтнага балета. У 18—19 ст. наз. па д'аксьён. Як аснову балетнага спектакля яго распрацоўвалі Ж.Ж.*Навер*, Ш.*Дзідло*, Г.*Анджаліні*. У канцы 19 — пач. 20 ст. паняцце Дз.т. стала больш шырокім і пачало ахопліваць усе разнавіднасці танца, які развівае дзеянне, у адрозненне ад дывертысментнага танца (гл. *Дывертысмент*), які выяўляе не дзеянне, а стан, і *пантамімы*, што раскрывае дзеянне, але не танц. сродкамі. Узоры Дз.т. стварылі балетмайстры І.Бельскі, В.Вайнонен, А.Вінаградаў, В.Гардзееў, Ю.Грыгаровіч, Р.Захараў, Л.Лаўроўскі, В.Чабукіяні і інш., на Беларусі — А.*Дадышкіліяні*, В.*Елізар'еў*.

ДЗЕКАБРЫ́СТЫ, расійскія дваранскія рэвалюцыянеры, якія ў снеж. 1825 узнялі паўстанне супраць самадзяржаўя і прыгону. У 1816 А.М.Мураўёў, С.П.Трубяцкой, І.Дз.Якушкін, С.І., М.І.Мураўёвы-Апосталы і М.М.*Мураўёў* заснавалі першае ў Расіі рэв. тайнае т-ва «Саюз выратавання». Пазней у яго ўвайшоў П.І.*Песцель*. Пошукі тактыкі дзеянняў і рознагалоссі па праграмных пытаннях прывялі да ліквідацыі т-ва і заснавання ў 1818 новай арг-цыі — «Саюза дабрабыту». У 1820 кіруючы орган т-ва найлепшай формай праўлення прызнаў рэспубліку, а асн. сілай пераваротy — армію. Ідэйная барацьба ўнутры т-ва і неабходнасць адсеву ненадзейных членаў прывялі ў 1821 да расколу «Саюза дабрабыту» і стварэння арг-цый — «Паўднёвага таварыства» і «Паўночнага таварыства».

«Паўднёвае таварыства» ўзнікла на Украіне, у г. Тульчын, дзе размяшчаўся штаб 2-й арміі. Кіраўнік арг-цыі Песцель распрацаваў прынцыпы грамадскага і дзярж. ладу краіны ў праграмным дакументе «Руская праўда», дзе прадугледжваліся ліквідацыя прыгону, надзяленне сялян зямлёю, частковае захаванне памешчыцкага землеўладання, абвяшчэнне Расіі рэспублікай, ліквідацыя саслоўяў, гарантыя грамадз. свабод: слова, друку, сходаў і інш. Паводле «Рускай праўды», усёй паўнатой заканад. улады ў краіне надзялялася аднапалатнае Нар. веча, выканаўчая ўлада даручалася Дзярж. думе. У 1825 у склад «Паўднёвага таварыства» ўвайшло «Таварыства з'яднаных славян», члены якога ставілі задачу аб'яднаць усе слав. землі ў дэмакр. федэрацыю. «Паўночнае таварыства» з цэнтрам у Пецярбургу ўзначаліў М.М.Мураўёў. Распрацаваны ім праект канстытуцыі больш памяркоўны, чым «Руская праўда», прадугледжваў ліквідацыю прыгону і саслоўяў, роўнасць усіх перад законам, прызнанне зямлі памешчыцкай уласнасцю і надзяленне сялян толькі сядзібнай зямлёй. Будучая Расія павінна была стаць канстытуцыйнай манархіяй. Заканад. ўладу меркавалася даць двухпалатнаму Нар. вечу, а выканаўчую — імператару. Раптоўную смерць Аляксандра I у ліст. 1825 Дз. выкарыстаць для ўзбр. выступлення і прызначылі яго на 14(26) снеж. 1825 — дзень прысягі новаму імператару Мікалаю I. Меркавалася прывесці на Сенацкую плошчу Пецярбурга войскі, якія спачувалі Дз., сарваць прысягу, прымусіць сенатараў падпісаць рэв. маніфест да рус. народа. Раніцай 14 снеж. першым прыйшоў на Сенацкую плошчу лейб-гвардыі Маскоўскі полк пад камандаваннем братоў А.А. і М.А.Бястужавых. Пазней да яго далучыліся лейб-гвардыі Грэнадзёрскі полк і гвардз. марскі экіпаж. Усяго прыйшло каля 3 тыс. салдат і 30 афіцэраў. На плошчы сабралася ішмат простага народу. Мікалай I сабраў верныя яму войскі і, выкарыстаўшы абарончую тактыку паўстанцаў, загадаў страляць карцеччу. Паўстанне ў Пецярбургу было задушана.

29.12.1825 (10.1.1826) члены «Паўднёвага таварыства» ўзнялі паўстанне ў Чарнігаўскім палку на чале з С.І.*Мураўёвым-Апосталам* і М.П.*Бястужавым-Руміным* (Песцеля на той час арыштавалі). Паўстанцы захапілі г. Васількоў, але 3(15).1.1826 былі разбіты ўрадавымі войскамі.

Рух Дз. быў пашыраны і ў Беларусі. Капітан К.Г.*Ігельстром*, А.І.*Вягелін* і шляхціц М.І.Рукевіч заснавалі ў 1825 т-ва *«Ваенныя сябры»*, у склад якога ўвайшлі афіцэры і салдаты Літоўскага асобнага корпуса, моладзь навуч. устаноў Гродзенскай губ. і Беластоцкай вобл., шляхта. Члены т-ва здзейснілі *Літоўскага пізнернага батальёна выступленне 1825*. У лют. 1826 узняць паўстанне ў Палтаўскім палку Бабруйскага гарнізона спрабаваў прапаршчык С.Трусаў, чл. «Таварыства з'яднаных славян», аднак тут жа быў арыштаваны. Царскі ўрад бязлітасна расправіўся з Дз.: 5 кіраўнікоў паўстання — Песцеля, С.І.Мураўёва-Апостала, Бястужава-Руміна, Рылеева, Кахоўскага — павесілі; 121 актыўнага ўдзельніка руху саслалі ў Сібір на катаргу і пасяленне, многіх афіцэраў і салдат саслалі на Каўказ, дзе ў той час вяліся ваен. дзеянні. Некат. Дз. адбывалі пакаранне ў Бабруйскай крэпасці. У Віцебску, Гродне, Магілёве, Мінску на будынках, звязаных з імёнамі Дз., устаноўлены мемар. дошкі. У Магілёве створаны музей Дз.

Кр.: Восстание декабристов: [Материалы и док.]. Т. 1—12. М.; Л., 1925—69.

Літ.: Нечкина М.В. Движение декабристов. Т. 1—2. М., 1955; Букчин С. К мечам рванулись наши руки. 2 изд. Мн., 1985; Декабристы: Биогр. справ. М., 1988; Бутов С.Е. «Заслуга невознаградимая...»: (Очерки о моряках-декабристах). М., 1995.

М.А.Тарасава.

ДЗЁКАННЕ, у беларускай мове фанетычная з'ява, звязаная са змяненнем гука «д» пры яго памякчэнні на мяккую афрыкату «дз» (за выключэннем «д» у прыстаўках, дзе яно не пераходзіць у «дз»). Развілося не пазней 14 ст., у помніках бел. мовы адлюстроўваецца з пач. 16 ст. («адзін за всехъ», «пападзись», «людзіе», «игдзе», «серца людзские»). Ёсць 2 погляды на паходжанне Дз. і *цекання* ў бел. мове. Выказаная ў 19 ст. А.А.Шахматавым гіпотэза пра запазычанне Дз. з польскай мовы не атрымала пашырэння. Агульнапрызнанай лічыцца гіпотэза Я.Ф.Карскага пра самаст. развіццё Дз. на бел. глебе.

Літ.: Юргелевіч П.Я. Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. Мн., 1974.

М.Р.Прыгодзіч.

ДЗЕЛАВЫ́Я ГУ́ЛЬНІ, метад імітацыі прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў у розных штучна падабраных сітуацыях, якія набліжаюцца да рэальных, сапраўдных. Ажыццяўляюцца шляхам гульні (гульняў) па зададзеных правілах групы людзей або чалавека з ЭВМ, пераважна ў галіне *менеджменту*, у камерцыйнай, фін. і іншых сферах. Выкарыстоўваюцца для навучання і адбору кіраўнікоў, н.-д. мэт, выпрацоўкі кіраўніцкіх рашэнняў.

ДЗЁЛЬКВА, зельква (Zelkova), род кветкавых раслін сям. ільмавых. 5—7 відаў. Пашыраны пераважна ва Усх. Азіі (Кітаі, Японіі і Карэі), па 1 віду трапляецца ў Паўн. Іране, на в-ве Крыт і ў Закаўказзі. Найб. вядомы трацічны рэліктавы від — Дз. грабалістая (у Закаўказзі захаваліся 200-гадовыя дрэвы).

Дрэва з гладкай цёмна-шэрай карой, выш. да 25, зрэдку да 40 м, дыям. ствала да 2 м. Жыве да 400 гадоў. Лісце чаргаванае, цэласнае, простазубчастае. Кветкі дробныя, зеленаватыя, двухполыя (адзіночныя) і тычынкавыя (у пучках). Плады — крылатыя арэшкі. Драўніна гнуткая, шчыльная, трывалая, дэкар., устойлівая да гніення, выкарыстоўваецца ў буд-ве.

Г.У.Вынаеў.

ДЗЁМБА Мар'ян (парт. псеўд. Я н ; каля 1885 — люты 1921), рэвалюцыянер, удзельнік барацьбы за сав. ўладу ў Беларусі. З 1906 чл. РСДРП. За рэв. дзейнасць зняволены ў турму. Удзельнік

Дзельква грабалістая.

Кастр. рэвалюцыі 1917 у Маскве. У жн. 1919 пакінуты ЦК КП(б)ЛіБ для падп. работы ў Мінску, акупіраваным польск. войскамі. Адзін з кіраўнікоў Мінскага падп. к-та КП(б)ЛіБ, вёў работу па арганізацыі камуніст. ячэек і партыз. атрадаў у Мінскай губ. З крас. 1920 на падп. рабоце ў Вільні. У канцы 1920 арыштаваны. Памёр у лагеры для інтэрніраваных.

ДЗЕМІДЗЕ́НКА Іван Якаўлевіч (5.8.1896, в. Стары Дзедзін Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 1.10.1956), бел. вучоны ў галіне ветэрынарнай хірургіі. Д-р вет. н., праф. (1941). Засл. дз. нав. Беларусі (1949). Скончыў Ленінградскі вет. ін-т (1926). З 1927 працаваў у Віцебскім вет. ін-це (у 1947—55 прарэктар). Навук. працы па пытаннях афтальмалогіі. Распрацаваў электратэрапію пры хірург. хваробах жывёл, паглыбіў распрацоўку вочнай семіётыкі пры септычных хваробах і хірург. сепсісе, сканструяваў спрошчаную шчылінную лямпу для біямікраскапіі вачэй жывёл.

ДЗЕМІДО́ВІЧ Барыс Паўлавіч (2.3.1906, г. Навагрудак Гродзенскай вобл. — 23.4.1977), савецкі матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1963), праф. (1965). Засл. дз. нав. РСФСР (1968). Сын П.П.*Дземідовіча*. Скончыў БДУ (1927). З 1935 у Маскоўскім дзярж. ун-це. Навук. працы па тэорыі ўстойлівасці, якаснай тэорыі звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў. Аўтар падручнікаў па матэматыцы для ВНУ.

Тв.: Лекции по математической теории устойчивости. М., 1967; Сборник задач и упражнений по математическому анализу. 9 изд. М., 1977.

ДЗЕМІДО́ВІЧ Леанід Аляксандравіч (н. 10.7.1937, Казань), бел. геолаг. Д-р геолага-мінералагічных н. (1981), праф. (1989). Скончыў Казанскі ун-т (1959). З 1959 у Бел. геолага-разведачным НДІ (з 1970 нам. дырэктара, у 1975—83 дырэктар). З 1983 у БДУ. Навук. працы ў галіне геалогіі, пошуку і разведкі нафтавых і газавых радовішчаў. Стварыў схемы класіфікацыі парод-калектараў, стадый і этапаў літагенезу.

Тв.: Формирование коллекторов нефтеносных комплексов Припятского прогиба. Мн., 1979. Литология и коллекторские свойства подсолевых девонских отложений Припятского прогиба. Мн., 1980.

ДЗЕМІДО́ВІЧ Павел Пятровіч (10.7.1871, в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. — 7.3.1931), бел. этнограф, фалькларыст, краязнавец і педагог. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1890), Віленскі настаўніцкі ін-т (1897). З 1890 настаўнічаў на Міншчыне і Навагрудчыне, з 1915 у Віцебску. З 1908 чл.-супрацоўнік аддз. этнаграфіі Т-ва аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім ун-це. З 1919 у Мінску, арганізатар і заг. 13-й бел. школы (з вер. 1919 рэарганізавана ў Мінскую бел. гімназію). У 1920—21 інструктар і заг. школьнага аддзела Наркамасветы БССР. З 1921 выкладчык і заг. аддзялення Мінскага ін-та нар. адукацыі, выкладчык у школах Мінска. З 1925 чл. этнагр. секцыі Інбелкульта. Вывучаў сямейны побыт, вераванні, абрады і звычаі беларусаў. Збіраў бел. нар. паданні, легенды і гутаркі (апубл. «Гутарку Паўлюка» ў газ. «Виленский вестник» 1898, № 173). У нарысе «З галіны вераванняў і паданняў беларусаў» (1896) апісаў нар. вераванні пра нячыстую сілу, ведзьмаў, ваўкалакаў, заклятыя мясціны, знахароў, прывёў замовы з Навагрудскага і Мінскага пав. Супрацоўнічаў з М.А.Янчуком і М.В.Доўнар-Запольскім. Апошняму перадаў частку свайго збору фальклорна-этнагр. матэрыялаў.

П.П.Дземідовіч.

Л.В.Дземянкоў.

М.І.Дземянцей.

Тв.: Рождественские святки // Виленский вестн. 1894. № 277, 281; 1895. № 3; Масленица и великий пост // Там жа. 1895. № 64, 67; Благовещение // Там жа. № 68; Пасха у сельчан белорусов // Там жа. № 73—74; Радуница в Белоруссии // Там жа. № 77; Купала в белорусской деревне // Там жа. № 134; Белорусские детские игры // Живая старина. 1898. Вып. 3/4.

Літ.: Гурскі А.І. З любоўю да народа. Мн., 1989. *І.У.Саламевіч.*

ДЗЕ́МІНА, возера ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрыса, за 35 км на ПдУ ад г.п. Расоны. Пл. 0,31 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 250 м. Пл. вадазбору 8,53 км^2. На Пд упадае ручай з воз. Доўгае-Мелкае. Злучана ручаём з р. Дрыса.

ДЗЕ́МІНЕЦ, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Крашанка, за 4 км на ПдУ ад г.п. Ушачы. Пл. 0,31 км^2, даўж. 1,3 км, найб. шыр. 520 м, найб. глыб. 2,9 м, даўж. берагавой лініі каля 4 км. Пл. вадазбору 24 км^2. Схілы катлавіны выш. да 8 м, параслі лесам. У паўд. плёсе 2 астравы агульнай пл. 2 га. Дно плоскае, выслана сапрапелямі. У возера ўпадаюць 4 ручаі, у т.л. з воз. Доўгі Дземінец і з возера без назвы; на Пн выцякае ручай у воз. Ваўчо.

ДЗЕМЯ́НІ Яўген Сяргеевіч (12.3.1898, С.-Пецярбург — 23.1.1969), расійскі акцёр і рэжысёр; адзін з заснавальнікаў сав. т-ра лялек. Засл. арт. Расіі (1934). У 1918 пачаў сцэн. дзейнасць як акцёр-аматар. У 1924 арганізаваў і ўзначаліў тэатр лялек-пятрушак у Ленінградзе, у 1930 аб'яднаны з Т-рам марыянетак Л.Шапорынай-Якаўлевай пад назвай Ленінградскі лялечны т-р пад кіраўніцтвам Я.Дземяні, дзе ён выступаў як акцёр і рэжысёр. Ставіў спектаклі для дзяцей і дарослых: «Казёл» (1925) і «Кошчын дом» (1926) С.Маршака, «Вяселле» А.Чэхава (1928), «Канёк-Гарбунок» паводле П.Яршова, «Казка пра згублены час» (1940) Я.Шварца, «Лекар паняволі» Мальера. Аўтар кніг і артыкулаў пра т-р лялек. З 1929 выступаў з лялькамі на эстрадзе.

ДЗЕМЯНКО́Ў Лаўрэнцій Васілевіч (15.7.1918, в. Сакалоўка Чэрыкаўскага

р-на Магілёўскай вобл. — 22.11.1993), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Томскі тэхнікум грамадскага харчавання (1938), 1-е Омскае ваен. пях. вучылішча (1941), Усесаюзны завочны фінансава-эканам. ін-т (1959). У Вял. Айч. вайну са студз. 1942 на Ленінградскім і Карэльскім франтах. Камандзір стралк. ўзвода лейт. Дз. вызначыўся ў чэрв. 1944 у баях у раёне г. Ладзейнае Поле Ленінградскай вобл.: гранатамі знішчыў 2 варожыя дзоты, тройчы штурмаваў траншэі праціўніка, паранены не пакінуў поля бою. Да 1960 у органах МУС і КДБ.

ДЗЕМЯНЦЕ́Й Мікалай Іванавіч (н. 25.5.1930, в. Хотліна Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.), дзяржаўны дзеяч Беларусі. Скончыў БСГА (1959), ВПШ пры ЦК КПСС (1964). З 1952 на выкладчыцкай і гасп. рабоце ў Віцебску і Полацкім р-не. У 1958—62 інструктар Віцебскага абкома, 2-і сакратар Віцебскага райкома КПБ, старшыня Віцебскага райвыканкома. З 1964 інструктар, нам. загадчыка, загадчык с.-г. аддзела Віцебскага абкома КПБ, 1-ы сакратар Ушацкага райкома КПБ. З 1970 інспектар ЦК КПБ, з 1974 сакратар Віцебскага абкома КПБ, з 1977 заг. с.-г. аддзела ЦК КПБ. У 1979—89 сакратар ЦК КПБ. У 1989—90 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета, нам. Старшыні Вярх. Савета СССР, чл. Савета Федэрацыі СССР, у 1990—91 Старшыня Вярх. Савета БССР. Пад яго старшынствам Вярх. Савет 27.7.1990 прыняў Дэкларацыю аб дзярж. суверэнітэце Беларускай ССР. Канд. у чл. ЦК у 1971—76, чл. ЦК з 1979, чл. Бюро ЦК КПБ у 1979—91. Дэп. Вярх. Савета БССР (з 1991 Рэспублікі Беларусь) у 1977—96, нар. дэп. СССР у 1989—91. З 1997 чл. Савета Рэспублікі Нац. сходу Рэспублікі Беларусь.

ДЗЕМЯХІ́, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., каля р. Ведрыч. Цэнтр

сельсавета і саўгаса. За 20 км на З ад Рэчыцы. 58 км ад Гомеля, 1 км ад чыг. ст. Дземяхі. 358 ж., 153 двары (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ДЗЕМЯШКЕ́ВІЧ Адам Станіслававіч (1.11.1902, г. Орша Віцебскай вобл. — 12.9.1962), генерал-лейтэнант авіяцыі (1959). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). У Чырв. Арміі з 1920. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., 1-м Бел. франтах. Удзельнік абароны Масквы, Ленінграда, вызвалення Польшчы, баёў за Берлін. Пасля вайны на адказных пасадах у Сав. Арміі, нам. нач. Ваенна-паветр. акадэміі.

ДЗЕМЯШКЕ́ВІЧ Сяргей Мікалаевіч (н. 28.8.1966, Мінск), бел. спартсмен (грэка-рымская барацьба). Засл. майстар спорту (1990). Пераможца Кубка свету (1988), чэмпіён свету (1991, 1993), бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў (1992).

ДЗЕ́НГА, д з е н ь г а (ад тат. ценга — сярэбраная манета), руская сярэбраная

Дзенга Наўгародскага княства, 15 ст. (1), Пятра I, 1700 (2), Аляксандра II, 1863 (3).

(14—17 ст.) і медная (18—19 ст.) манета. Да сярэдзіны 1530-х г. маса 0,78—0,79 г (наўгародска-пскоўская стапа), 0,31—0,40 г (маскоўская стапа). Пасля грашовай рэформы 1533—35 маса Дз.-наўгародкі 0,68 г ($^1/_{100}$ лікавага рубля, такая Дз. стала першай рус. капейкай), маса Дз.-маскоўкі 0,34 г (1/2 капейкі). Да канца 17 ст. маса Дз. паменшылася да 0,14 г. Спарадычна чаканіліся залатая і медная Дз. Пасля грашовай рэформы Пятра I у 1700—1828 чаканілася медная Дз., роўная $^1/_2$ капейкі. Пасля манета выпускалася з пазначэннем наміналу «дзенежка» (1849—63) і «$^1/_2$ капейкі» (1839—1916).

ДЗЕНІСЕ́ВІЧ Уладзімір Лук'янавіч (н. 15.2.1936, в. Заполле Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне заатэхніі. Д-р с.-г. н. (1993), праф. (1996). Скончыў Гродзенскі с.-г. ін-т (1959). З 1973 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі (адначасова з 1996 у Бел. с.-г. акадэміі). Навук. працы па расплоджванні і селекцыі с.-г. жывёлы, папуляцыйнай генетыцы і бялковым полімарфізме жывёл, гетерозісе ў жывёлагадоўлі. Адзін з аўтараў бел. чорна-пярэстай пароды свіней.

Тв.: Состояние гаптоглобинового (Hp) локуса и продуктивность свиней белорусской черно-пестрой породы // Материалы XVI-й международной конференции по группам крови и биохимическому полиморфизму животных. Т. 3. Л., 1979; Направление племенной работы со свиньями белорусской черно-пестрой породы (разам з Г.К.Валаховіч) // Государственная книга племенных свиней черно-пестрой породы. Мн., 1990. Т. 3; Вкусовые качества мяса молодых свиней // Зоотехническая наука Беларуси: Сб. ст. Мн., 1996. Т. 32.

ДЗЕНІСЕ́НКА Іван Піліпавіч (1913, в. Норкі Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 5.7.1943), паэт, журналіст. Пісаў на рус. мове. З 1933 працаваў у чэрыкаўскай раённай газ. «Сацыялістычная перамога». З 1937 друкаваў вершы, допісы, нарысы ў рэсп. прэсе. У Айч. вайну ўдзельнічаў у партыз. руху. Па заданні падп. райкома КПБ стаў сакратаром чэрыкаўскай акруговай паліцыі. Стварыў у Чэрыкаве антыфаш. арг-цыю. Быў выдадзены і арыштаваны. Пасля катаванняў расстраляны.

Літ.: Цітоў К. Людзі, ён любіў вас! // Полымя. 1964. № 7.

ДЗЕНІСЮ́К Юрый Мікалаевіч (н. 27.7.1927, г. Сочы, Расія), расійскі фізік, адзін са стваральнікаў галаграфіі. Акад. Рас. АН (1992, чл.-кар. з 1970). Скончыў Ленінградскі ін-т дакладнай механікі (1954). З 1954 у Дзярж. аптычным ін-це, з 1989 у Фізіка-тэхн. ін-це Рас. АН (С.-Пецярбург). Навук. працы па фіз. оптыцы і галаграфіі. Абгрунтаваў і распрацаваў (1962) метад стварэння аб'ёмных галаграм, якія ўзнаўляюць каляровы відарыс аб'екта пры дапамозе звычайных крыніц святла. Ленінская прэмія 1970, Дзярж. прэмія СССР 1982.

Тв.: Принципы голографии. Л., 1978.

Літ.: Ю.Н. Денисюк // Оптико-мех. промышленность. 1977. № 9.

«ДЗЕ́ННІК ВІЛЕ́ЊСКІ» («Dziennik Wileński», «Віленскі дзённік»), навукова-літаратурны часопіс. Выдаваўся штомесячна ў 1805—06 і 1815—30 у Вільні на польскай мове. Асвятляў пытанні навукі, л-ры, культуры (з 1822 і падзеі грамадска-паліт. жыцця), прапагандаваў новыя тэхналогіі ў прам-сці і сельскай гаспадарцы.

Друкаваў матэрыялы па гісторыі, філасофіі, правазнаўстве, прыродазнаўчых навуках, геаграфіі, мовазнаўстве, фальклоры і этнаграфіі, міфалогіі і гісторыі культуры, праблемах выхавання і асветы. Сярод публікацый даследаванні па гісторыі ВКЛ М.Баброўскага, М.Балінскага, І.Даніловіча, І.Лялевеля, Т.Нарбута, маст. творы А.Міцкевіча, Т.Зана і інш. У 1826 рэарганізаваны, пачалі выходзіць спец. выпускі: «Гісторыя і літаратура», «Навука і мастацтва», «Мастацкая літаратура», «Прыкладныя навукі», «Навуковыя навіны». У 1831 забаронены.

А.Ф.Смалянчук.

ДЗЕНЬ, светлая частка сутак паміж усходам і захадам верхняга краю Сонца. Працягласць (даўжыня) Д. залежыць ад геагр. шыраты месца і схілення Сонца. На зямным экватары даўжыня Д. прыблізна пастаянная і роўная 12 гадз, у Паўн. паўшар'і Зямлі — больш за 12 гадз пры дадатным схіленні Сонца (вясной і летам) і менш за 12 гадз пры адмоўным схіленні (увосень і зімой).

І.П.Дзенісенка.

Ю.М.Дзенісюк.

Найб. даўжыня Д. ў Паўн. паўшар'і бывае ў Дз. летняга сонцастаяння (21—22 чэрв.), найменшая — у Дз. зімовага сонцастаяння (21—22 снеж.). За палярным кругам даўжыня Д. летам можа перавышаць 24 гадз (палярны Дз.), на полюсах — Дз. цягнецца паўгода. Самы доўгі Дз. у Мінску складае 17 гадз 11 мін, самы кароткі — 7 гадз 21 мін. Часта Д. называюць *суткі*.

ДЗЕНЬ БЕЛАРУ́СКАГА ПІСЬМЕ́НСТВА І ДРУ́КУ, нацыянальнае бел. свята. Адзначаецца з 1994 у першую нядзелю верасня. Праводзіцца з мэтай ушанавання гісторыі нац. культуры, цяснейшага далучэння беларусаў да сваіх духоўных святыняў. Цэнтрам свята становіцца пэўны горад: Полацк (1994), Тураў (1995), Навагрудак (1996), Нясвіж (1997). Праводзяцца ўшанаванні святых мясцін Беларусі, адкрыццё помнікаў, бюстаў, ганаровых дошак беларусам, што працавалі на ніве асветніцтва (бюст першаму консулу Расіі ў Японіі І.Гашкевічу ў г.п. Астравец Гродзенскай вобл., 1994; помнік св. Елісею Лаўрышаўскаму ў в. Лаўрышава Навагрудскага р-на, 1996, і інш.), выстаўкі кнігі, «круглыя сталы» па пытаннях бел. кнігадрукавання, фестывалі бел. прэсы і інш.; канцэрты, маст. прадстаўленні, малебны. У свяце ўдзельнічаюць грамадскія дзеячы, майстры мастацтваў, прадстаўнікі духавенства, шырокая грамадскасць.

Т.А.Меляшкевіч.

ДЗЕНЬ ВЕ́ДАЎ, свята, якое адзначаецца 1 верасня. Устаноўлена паводле Указа Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 15.6.1984. У Рэспубліцы Беларусь у Дз.в. у школах традыцыйна праводзяцца тэматычныя лекцыі, гутаркі, урачыстыя лінейкі, запрашаюцца прадстаўнікі грамадскіх арг-цый, навукоўцы, работ-

нікі культуры, адукацыі, ветэраны вайны і працы і інш. *А.Л.Еўдакімава.*

ДЗЕРАВЯ́НЧЫЦЫ, вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 8 км на ПдЗ ад горада і 10 км ад чыг. ст. Слонім, 156 км ад Гродна. 406 ж., 136 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ДЗЕРАВЯ́ШКІ, у беларусаў абутак з дрэва, які насілі вясной і восенню. Бытавалі ў 19 — пач. 20 ст. пераважна на Гродзеншчыне і на З Віцебшчыны (спарадычна трапляліся ў інш. рэгіёнах Беларусі). Былі 2 тыпаў: выдзеўбаныя з кавалка дрэва башмакі, з круглым або завостраным наском і камбінаваныя туфлі на нізкім ці высокім абцасе, да драўлянай падэшвы якіх прымацоўваўся скураны верх або шырокая скураная паласа.

Дзеравяшкі.

Дзераза булавападобная.

ДЗЕРАЗА́, лікаподый (Lycopodium), род споравых раслін сям. дзеразовых. 10 відаў. Пашыраны пераважна ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі 2 віды: Дз. булавападобная (L. clavatum) і гадавая (L. annotinum). Растуць у яловых, хваёвых, радзей у мяшаных і лісцевых лясах.

Шматгадовыя вечназялёныя расліны з доўгімі вілавата-галінастымі (дыхатамічнымі) паўзучымі сцёбламі даўж. да 2 м. Ад сцёблаў адыходзяць верт. густаабліснелыя парасткі выш. да 30 см, са стробіламі на канцах. Лісце дробнае, сядзячае, лінейна-ланцэтнае, размешчана спіралямі. Стробілы адзіночныя або іх па некалькі на канцах галінак, сядзячыя ці на доўгіх ножках. Лек., фарбавальныя (даюць жоўтую фарбу) і дэкар. расліны; некат. віды ядавітыя. Сухія споры маюць да 50% тлустага алею, выкарыстоўваюцца ў медыцыне (як дзіцячая прысыпка), у ліцейнай вытв-сці. Да роду Дз. часам далучаюць таксама расліны з родаў *баранец*, *дзярэзка*, *дыфазіястр*.

Г.У.Вынаеў.

ДЗЕРАЗАПАДО́БНЫЯ (Lycopodiophyta), аддзел вышэйшых споравых раслін. Найб. прымітыўная і стараж. з вышэйшых раслін сістэм. група. Вышэйшага развіцця дасягнулі ў кам.-вуг. перыядзе. Уключаюць 2 класы: дзеразовыя (Lycopodiopsida) і палушнікавыя (Isoetopsida), 8 родаў і каля 1300 відаў. Пашыраны па ўсім зямным шары, асабліва ў трапічных і субтрапічных лясах. На Беларусі 7 відаў з родаў *баранец*, *дзераза*, *дзярэзка*, *дыфазіястр* і *палушнік*. Растуць у яловых, хваёвых, радзей у мяшаных і лісцевых лясах, на балотах, у азёрах. Баранец звычайны, дзярэзка заліўная, палушнік азёрны занесены ў Чырв. кнігу Рэспублікі Беларусь.

Сучасныя Дз. — раўна- (дзярэзы і інш.) і разнаспоравыя (селягінелы, палушнікі) шматгадовазялёныя травяністыя расліны, рэдка паўкусты (сярод выкапнёвых Дз. былі і дрэвы — лепідадэндраны і сігілярыі) з чаргаваннем пакаленняў — *спарафіту* (бясполае) і *гаметафіту* (палавое). Спарафіт мае дадатковыя карані, сцяблы і лісце (філоіды). Лісце вузкае, дробнае, простае, сядзячае, чаргаванае або супраціўнае, размешчанае па спіралі, зрэдку сабранае ў кальчакі. Размнажаюцца Дз. спорамі. Са споры развіваецца гаметафіт (зарастак) — падземны або надземны, зялёны або бясколерны сапратрофны, утвараюцца мужч. і жан. гаметангіі — *антэрыдый* і *архегоній*. Потым адбываецца палавы працэс, у выніку якога фарміруецца спарафіт. Лек., фарбавальныя (даюць жоўтую і зялёную фарбы) і дэкар. расліны; некат. віды ядавітыя.

Літ.: Бобров А.Е. Отдел 1. Lycopodiophyta — Плаунообразные // Флора европейской части СССР. Л., 1974. Т. 1; Филин В.Р. Отдел Плауновидные (Lycopodiophyta) // Жизнь растений. М., 1978. Т. 4.

Г.У.Вынаеў.

ДЗЕРАНО́К Таццяна Фёдараўна (н. 1.7.1920, в. Неглюбка Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. майстар нар. маст. ткацтва. Жыве і працуе ў в. Неглюбка. У тэхніках закладнога і пераборнага ткацтва выконвае ручнікі, аздобленыя геам. арнаментам (спалучэнне чырвонага і чорнага колераў на белым фоне), які шчыльнымі палосамі ўкрывае б. ч. паверхні вырабаў (гл. *Неглюбскія ручнікі*). Кіруе гуртком «Юныя ткачыхі» пры Неглюбскай сярэдняй школе (з 1979).

ДЗЕРАЎНА́Я, вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Іса. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 15 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Слонім, 163 км ад Гродна. 518 ж., 348 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Троіцкая царква (2-я пал. 19 ст.).

ДЗЕРАЎНА́Я, вёска ў Хатаўскім с/с Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл., на аўтадарозе Стоўбцы—Івянец. Цэнтр калгаса. За 28 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Стоўбцы, 106 км ад Мінска. 1749 ж., 564 двары (1997).

Вядома з 1-й пал. 15 ст. як маёнтак, каля якога ў 1525 М.Кежгайла заснаваў мястэчка. Належала Кежгайлам, Завішам, Радзівілам. У 1590—91 пабудаваны кальвінскі збор. З 1793 у Рас. імперыі ў Ашмянскім пав. У 1870-я г. ў Дз. касцёл, капліца, 2 сінагогі, школа, багадзельня, бровар, 5 крам. У 1880 — 306 ж., вінзавод, саладоўня, капліца, царк. прыход,

Т.Дзеранок. Ручнік. 1970-я г.

цэнтр воласці, у 1897 — 823 ж., 125 двароў. З 1921 у Польшчы, з 1939 у БССР. У 1940—54 цэнтр сельсавета Івянецкага р-на, з 1962 у Стаўбцоўскім р-не. У 1971 у Дз. 938 ж., 255 двароў.

ПМК-74. Сярэдняя школа, 2 дамы культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Дзераўноўскі касцёл Благавешчання і капліца (19 ст.).

ДЗЕРАЎНО́ЎСКІ КАСЦЁЛ БЛАГАВЕ́ШЧАННЯ, помнік архітэктуры готыкі і рэнесансу. Засн. ў 1590 М.К.Радзівілам і Г.Э.Вішнявецкай у в. Дзераўная Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. Пабудаваны ў 1-й пал. 17 ст., у 2-й пал. 17 ст. прыбудавана цагляная вежа. Рэстаўрыраваўся ў пач. 18 ст., вежа заменена новай.

Мураваны 1-нефавы 1-вежавы храм з 5-граннай апсідай накрыты высокім 2-схільным

дахам. Да апсіды з бакоў прымыкаюць прамавугольныя сакрысціі. 3-ярусная вежа на гал. фасадзе (ніжнія ярусы чацверыковыя, верхні — 8-гранны) накрыта высокім шатром. Сцены ўмацаваны рытмічна размешчанымі вертыкальнымі контрфорсамі. Вокны з паўцыркульнымі завяршэннямі. Унутры неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі. Асн. памяшканне злучана з апсідай арачным праёмам. *А.А.Ярашэвіч.*

ДЗЯ́РБНІК (Falco columbarius), птушка сям. сакаліных атр. сокалападобных. Пашыраны ў тайзе, лесатундры, часткова ў тундры Еўразіі і Паўн. Амерыкі. Па тэр. Беларусі праходзіць паўд. мяжа гнездавога арэала. Жыве ва ўсіх абласцях, акрамя Брэсцкай, часцей трапляецца ў Бел. Паазер'і на вял. вярховых балотах. Нар. назва галубятнік. Занесены ў Чырв. кнігу Рэспублікі Беларусь.

Даўж. цела 27—34 см, маса 160—250 г. Самкі большыя за самцоў. Крылы адносна кароткія, хвост доўгі. Апярэнне ў самцоў шызае, у самак дымчата-бурае, брушны бок белавата-рыжы з падоўжнымі стракацінамі, хвост паласаты. Корміцца пераважна дробны-

Дзераўноўскі касцёл Благавешчання.

мі птушкамі. Гняздуецца на дрэвах у гнёздах інш. птушак, на зямлі, скалах, зрэдку будуе гняздо. Нясе 3—6 яец.

ДЗЕРВЯНІ́СКАЕ ВО́ЗЕРА, Кальніца, у Гродзенскім р-не, у бас. р. Пыранка, за 32 км на ПнУ ад Гродна. Пл. 1,04 км^2, даўж. 3,9 км, найб. шыр. 420 м, даўж. берагавой лініі больш за 9 км.

Дзярбнік: 1 — самец; 2 — самка.

Схілы катлавіны выш. 9—10 м, стромкія, пад лесам. Берагі пераважна супадаюць са схіламі. Праз возера цячэ р. Сламянка (злучае яго з азёрамі Вераўскае і Стаў), упадае ручай з воз. Чартова.

ДЗЕРУЖЫ́НСКІ Аваяр'ян Сафонавіч (н. 10.6.1919, в. Хляўно Кармянскага р-на Гомельскай вобл.), бел. паэт. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі ў Мінску (1941). Працаваў у прэсе, з 1949 у выд-ве «Беларусь», з 1972 у выд-ве «Мастацкая літаратура», у 1981—84 у выд-ве «Юнацтва». Друкуецца з 1939. Першы зб. вершаў «Песні маладосці» (1959). Піша пераважна для дзяцей: зб-кі «Цуды ёсць на свеце» (1960), «Дзе жыве зіма» (1962), «Кую-кую ножку» (1967), «Смешкі і пацешкі» (1968), «Чабарок» (1970), «Конікі-будаўнікі» (1977), «Касмічны агарод» (1981), «Працалюбы» (1987) і інш. Аўтар тэкстаў песень «Мінскі вальс», «Дзявочая лірычная», «Беларусь» і інш., песні «Мяцеліца» і «Сабірайся ў госці, мой дзядок» сталі народнымі.

Тв.: Добры ветрык. Мн., 1969; Вяселікі: Выбранае. Мн., 1979; Бярозавы вецер: Лірыка і гумар. Мн., 1990; Веснавей. Мн., 1994; Азбукі. Мн., 1997. *І.У.Саламевіч.*

ДЗЕРУЖЫ́НСКІ Францішак (3.1.1779, г. Орша, Віцебскай вобл. — 22.9.1850), бел. рэліг. дзеяч, адзін з пачынальнікаў адукацыйнай сістэмы каталіцкай царквы ў ЗША. Скончыў езуіцкі калегіум у Оршы, у 1794 уступіў у ордэн езуітаў. У 1809 пасвячоны ў ксяндзы. Выкладаў тэалогію ў школах Аршаншчыны і Магілёўшчыны, у Полацкай езуіцкай акадэміі. З 1821 у ЗША, адзін з кіраўнікоў сістэмы адукацыі каталіцкай царквы ў краіне, з 1823 узначаліў ордэн езуітаў у ЗША. *Л.У.Языковіч.*

ДЗЕРЦЬ, зерне, здробненае зернедрабілкамі або на млыне без спец. ачысткі. Здрабняюць пераважна зерне з цвёрдай абалонкай — ячмень, проса, сорга, сухую кукурузу, віку, гарох і інш. Выкарыстоўваецца ў кармленні с.-г. жывёл, у рацыён уключаюць сумесі Дз. з сакаўнымі кармамі, а таксама Дз. дражджаваную.

ДЗЕСЯ́ТАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ КП(б)Б, гл. *Пяты з'езд КП(б)Б.*

ДЗЕСЯТКО́ВАЯ СІСТЭ́МА ЛІЧЭ́ННЯ, найбольш пашыраная пазіцыйная сістэма лічэння з асновай 10. Мае 10 сімвалаў — лічбы 0, 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9. Мяркуюць, што выбар у якасці асновы ліку 10 бярэ пачатак ад лічэння на пальцах. Узнікла на аснове нумарацыі, якая зародзілася ў Індыі ў 5 ст., назву арабскай атрымала таму, што ў Еўропе з ёй пазнаёміліся ў 10—12 ст. па лац. перакладах з араб. мовы; у Расіі Дз.с.л. пачала пашырацца з 17 ст.

Пазіцыйны прынцып Дз.с.л. азначае, што адзін і той жа знак (лічба) мае розныя значэнні ў залежнасці ад таго месца, на якім ён стаіць, і таму асобныя сімвалы патрэбныя толькі пры запісе першых 10 лікаў. Лік 10 (аснова Дз.с.л.) утварае адзінку 2-га разраду, 10 адзінак 2-га разраду (лік 100 = 10^2) — адзінку 3-га разраду і г.д. (адзінка кожнага наступнага разраду ў 10 разоў большая за адзінку папярэдняга). Для запісу ліку ў Дз.с.л. выяўляюць колькасць адзінак найвышэйшага разраду, потым у астачы — колькасць адзінак разраду, на 1 меншага, і г.д. Атрыманыя лічбы запісваюць побач, напр., $4 \cdot 10^2 + 7 \cdot 10^1 + 3 \cdot 10^0 = 473$. Гл. таксама *Лічэнне.* *М.П.Савік.*

ДЗЕСЯТКО́ВЫ ДРОБ, дроб, назоўнік якога ёсць цэлая ступень ліку 10. Звычайна запісваюць без назоўніка, аддзяляючы ў лічніку справа коскай (часам кропкай) столькі лічбаў, колькі нулёў у назоўніку, напр., 785/10 = 78,5; 4/100 = 0,04. У Еўропе Дз.д. увёў нідэрл. вучоны С.Стэвін (1584), у Расіі — Л.П.Магніцкі (1703).

Пры такім запісе Дз.д. лічбы злева ад коскі азначаюць цэлую частку дробу. Звычайны дроб, назоўнік якога мае здабытак ступеней лікаў 2 і 5, можна пераўтварыць у канечны Дз.д. (напр., 1/5 = 0,2), а калі ёсць і інш. множнікі — у бясконцы перыядычны (8/15 = 0,53333...). Ірацыянальныя лікі запісваюцца бясконцымі неперыядычнымі Дз.д. (π = =3,1415926...).

ДЗЕСЯТКО́ВЫ ЛАГАРЫ́ФМ ліку, паказчык ступені, у якую патрэбна ўзвесці лік 10, каб атрымаць зададзены лік; *лагарыфм* па аснове 10. Дз.л. ліку N абазначаецца lg N; напр., lg 2 = 0,3010, lg 20 = 1,3010, lg 100 = 2.

ДЗЕСЯ́ТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 3—10.1.1927 у Мінску. Прысутнічала 278 дэлегатаў з рашаючым і 226 з дарадчым голасам ад 30 995 чл. і канд. у чл. партыі. Парадак дня: справаздачы ЦК КП(б)Б — паліт. і арганізац. (А.І.Крыніцкі, М.М.Галадзед), ЦКК КП(б)Б (В.А.Радус-Зяньковіч); даклады ЦКК ВКП(б) (Я.Х.Петэрс), Рэвіз. камісіі КП(б)Б (А.А.Чарнушэвіч); вынікі гасп. будаўніцтва ў БССР і далейшыя задачы (Я.А.Адамовіч); выбары ЦК, ЦКК і Рэвіз. камісіі КП(б)Б. З'езд падвёў вынікі работы КП(б)Б за 1926, ухваліў паліт. лінію і практычную дзейнасць ЦК КП(б)Б. Прапанаваў ураду БССР умацаваць мат.-тэхн. базу саўгасаў, стварыць фонд для крэдытавання калектыўных гаспадарак. Аналізуючы ход культ. будаўніцтва, з'езд патрабаваў у правядзенні нац. палітыкі ажыццяўляць *беларусізацыю*, павялічыць асігнаванні на нар. асвету, згуртаваць вакол партыі інтэлігенцыю, умацоўваць і павышаць парт. кіраўніцтва друкам. Даручыў ЦК рашуча змагацца з ідэйнымі ўхіламі, паслядоўна ажыццяўляць курс на *індустрыялізацыю*, прапанаваў умацаваць кіруючую ролю партыі ва ўсіх галінах сацыяліст. будаўніцтва. Выбраў ЦК КП(б)Б з 62 чл. і 43 канд. у чл., ЦКК КП(б)Б з 37 чл. і 11 канд. у чл., Цэнтр. рэвіз. камісію КП(б)Б з 7 чл.

Літ.: X съезд Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии: Стеногр. отчет. Мн., 1927; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. 1918—1927. Мн., 1983.

А.І.Яфімчык.

ДЗЕСЯЦІ́НА (лац. decima, франц. dîme, ням. Zehnt, англ. tithe), 1) дзесятая частка даходу, якая збіралася царквою з насельніцтва ў сярэдневяковай Еўропе (Дз. царкоўная). Узнікла ў канцы 6 ст. У Стараж. Русі ўстаноўлена кн. Уладзімірам Святаславічам пасля хрышчэння Русі і прызначалася першапачаткова для Кіеўскай Дзесяцінай царквы, а пазней набыла характар паўсюднага падатку, які збіраўся царк. арг-цыямі (але не манастырамі). У ВКЛ у 15—16 ст. была Дз. «снаповая» (сялянe аддавалі кожны 10-ы сноп) і агульная ($^1/_{10}$ частка збожжа, мёду і інш.). 2) Стараж.-рус. мера зямельных плошчаў. Першапачаткова ўяўляла сабой квадрат з бакамі, якія раўняліся $^1/_{10}$ вярсты (адсюль назва); пл. 2500 кв. сажняў. Як гал. пазямельная адзінка Расіі ўведзена Межавой інструкцыяй 1753 у выглядзе казённай Дз. плошчай 2400 кв. сажняў, або 1,0925 га. Скасавана ў 1918 з пераходам да метрычнай сістэмы мер.

Я.К.Анішчанка.

ДЗЕСЯЦІНО́ГІЯ РАКАПАДО́БНЫЯ (Decapoda), атрад беспазваночных падкл. вышэйшых ракападобных. 2 падатр. — Natantia (*крэветкі*) і Reptantia (*рачныя ракі, амары, лангусты, крабы, ракі-пустэльнікі*). Больш за 8500 відаў. Больш пашыраны ў морах, менш — у прэсных вадаёмах і на сушы. На Беларусі жывуць рачныя ракі; рак шыракапальцы занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. цела да 80 см, размах клюшняў да 3 м. Характэрная прыкмета Дз.р. — зліццё сківічных сегментаў галавы з грудзьмі і пераўтварэнне 3 пярэдніх пар канечнасцей грудзей у нагасківіцы, якія ўдзельнічаюць у перадачы корму да ротавай адтуліны; 5 пар задніх грудных ног хадзільныя (адсюль назва); на некат. часта развіваюцца клюшні. Галава і грудзі ўкрыты зверху галавагрудным шчытом (карапаксам). Вочы сцябліністыя, фасетачныя. Раздзельнаполыя. Самкі (акрамя крэветак) выношваюць яйцы на брушных ножках. Лічынкі рэзка адрозніваюцца ад дарослых; у многіх развіццё прамое. Кормяцца жывёльным і раслінным кормам. Некат. — аб'екты промыслу і развядзення.

ДЗЕСЯ́ЦКІ, у Расіі ў 14 — пач. 20 ст. ніжэйшы выбарны (з 18 ст. паліцэйскі) чын, які дапамагаў уладам пры вышуку і судзе. Звычайна выбіраўся ад 10 двароў. На Беларусі пасада Дз. існавала ў канцы 18 — пач. 20 ст.

ДЗЕ́СЯЦЬ ЗА́ПАВЕДЗЕЙ, у іудзейскай і хрысц. рэлігіях — прадпісанні сац. і маральнага характару, якім царква надае божы аўтарытэт (гл. ў арт. *Запаведзь*).

ДЗЕ́ТКАВІЧЫ, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Антопаль—Бяроза. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 35 км на ПнЗ ад Драгічына, 92 км ад Брэста, 20 км ад чыг. ст. Гарадзец. 611 ж., 244 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Пакроўская царква (1740).

ДЗЕФІРЭ́ЛІ (Zeffirelli) Франка (н. 12.2.1923, г. Фларэнцыя, Італія), італьянскі рэжысёр, мастак. Вучыўся ў Акадэміі прыгожых мастацтваў у Фларэнцыі. Працаваў акцёрам і асістэнтам у Л.*Вісконці*. З 1950-х г. ставіў драм. і оперныя спектаклі ў Італіі і за мяжой. Мастак шэрагу сваіх пастановак. З 1957 у кіно. Вядомасць яму прынеслі экранізацыі твораў У.Шэкспіра «Утаймаванне свавольніцы» (1967) і «Рамэо і Джульета» (1968, «Оскар»). Сярод інш. фільмаў: «Брат Сонца, сястра Месяц» (1972), «Ісус з Назарэта» (1977, тэле- і кінаварыянты), кінаверсія оперы «Травіята» Дж.Вердзі (1982). Для рэжысуры Дз. характэрныя ўвага да вытанчаных маляўнічых кампазіцый кадра, імкненне да праўдзівай рэканструкцыі эпохі.

ДЗЕХЦЯРЭ́НКІ, Міхаіл Васілевіч (н. 18.5.1918, в. Траянаў Жытомірскай

М. і В. Дзехцярэнкі. Куфэркі. 1970.

вобл., Украіна) і Вера Нікадзімаўна (н. 24.5.1923, г. Жлобін Гомельскай вобл.), бел. майстры маст. аплікацыі саломкай па дрэве. На аснове мясц. нар. традыцый аплікацыі саломкай утылітарнамаст. вырабаў распрацавалі тэхналогію аздаблення сувенірных вырабаў (куфэркаў, сальніц, рамак для фотаздымкаў і інш.). Арганізатары (1955) цэха інкрустацыі пры *Жлобінскай фабрыцы інкрустацыі*.

Я.М.Сахута.

ДЗЕ́ЦІ БАЯ́РСКІЯ, гл. ў арт. *Служылыя людзі*.

ДЗЕ́ЦКІ, 1) у Стараж. Русі з 11 ст. прадстаўнік ніжэйшай («малодшай») часткі *дружыны*. У сац.-грамадскай сферы выконваў шэраг паліцэйскіх, адм. функцый. У надзвычайных абставінах мог быць пераведзены ў *баяры* і атрымаць пасадніцтва. Дз. складалі сталы вайсковы аддзел, які знаходзіўся ў непасрэдным распараджэнні князя або кіраўніцтва земскай абшчыны. Па меры разлажэння дружыны Дз. трацілі рысы дружыннай структуры і паглынуты княжацкім дваром. 2) У ВКЛ у 15—16 ст. службовая асоба, якая па даручэнні вял. князя, ваяводы, старосты ці інш. прадстаўнікоў улады затрымлівала і дастаўляла абвінавачанага ў суд. З 1566 функцыі Дз. выконваў *возны*.

Г.В.Ласкавы.

ДЗЕ́ЧКА Эдуард Міхайлавіч (н. 24.1.1936, г. Мазыр Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне металаапрацоўкі. Д-р тэхн. н. (1989), праф. (1990). Скончыў БПІ (1958), у ім і працаваў. З 1970 рэктар Рэсп. міжгалінавага ін-та павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў галін нар. гаспадаркі, з 1990 у БПА. Навук. даследаванні па працэсах апрацоўкі металакерамічных матэрыялаў і свідравання глыбокіх адтулін у сталях.

Тв.: Обработка отверстий в металлокерамических деталях. Мн., 1965; Сверление глубоких отверстий в сталях. Мн., 1979.

ДЗЕ́Я, закончаная частка п'есы і спектакля (драм., оперная, балетная, музычная). Падзел п'есы на Дз. ці акты звязаны з яе кампазіцыяй, са стылем і жанрам твора. У т-ры гэты падзел залежыць яшчэ і ад існуючых у пэўны перыяд нарматываў у дачыненні да спектакля.

ДЗЕЯЗДО́ЛЬНАСЦЬ, у праве здольнасць грамадзяніна або юрыдычнай асобы сваімі дзеяннямі набываць правы і ствараць для сябе юрыдычныя абавязкі, несці адказнасць за ўчыненае правапарушэнне. У Рэспубліцы Беларусь поўнай Дз. валодаюць грамадзяне па дасягненні паўналецця (18 гадоў). Юрыд. асобы набываюць Дз., як і *праваздольнасць*, з моманту іх узнікнення. Правы і законныя інтарэсы непаўналетніх, а таксама грамадзян, прызнаных недзеяздольнымі ў выніку псіхічнай хваробы або разумовай непаўнацэннасці, абараняюцца іх законнымі прадстаўнікамі — бацькамі, усынавіцелямі або

апекунамі. Ніхто не можа быць абмежаваны ў Дз. інакш, як у выпадках, прадугледжаных законам. *С.У.Скаруліс.*

ДЗЕ́ЯННЕ, дыскрэтная або безупыннае праява якой-н. прадметна-матэрыяльнай ці разумовай актыўнасці; і як адзінка *дзейнасці*. Адрозніваюць Дз. фіз., біял., псіхічнае, лагічнае, *дзеянне сацыяльнае*. У якасці філас. катэгорыі Дз. суадносіцца з перажываннем ці пакутамі (Платон, Арыстоцель); разглядаецца як момант руху разам з супрацьдзеяннем (І.Ньютан, Ф.Энгельс); трактуецца як прычына, вынік (Б.Спіноза, І.Кант, Г.Гегель); у супастаўленні з інертным матэрыяльным быццём тлумачыцца як праява творча-дзейнага духу ці самасвядомасці суб'екта (Аўтусцін, Г.Лейбніц, І.Фіхтэ, М.А.Бярдзяеў). Паняццем «Дз.» выяўляецца наяўная актыўнасць (сапраўднасць) якой-н. сілы ў адрозненне ад магчымасці (патэнцыяльнасці) яе праяўлення.

Літ.: Григорьев В., Мякишев Г. Силы в природе. 7 изд. М., 1988. Петровский А.В., Ярошевский М.Г. История и теория психологии. Т. 2. Ростов н/Д, 1996. *А.Ю.Харын.*

ДЗЕ́ЯННЕ ў фізіцы, фізічная велічыня, якая мае размернасць здабытку энергіі на час (або імпульсу на перамяшчэнне); адна з найважнейшых характарыстык дыскрэтных мех. сістэм.

У залежнасці ад выбранай фармулёўкі *варыяцыйных прынцыпаў механікі* выкарыстоўваюцца 2 вызначэнні Дз.: паводле Гамільтана $S = \int_{t_0}^{t} L dt$ і паводле Лагранжа $W = \int_{t_0}^{t} 2T dt$, дзе $L = T-U$ — функцыя Лагранжа, T і U — кінетычная і патэнцыяльная энергіі сістэмы адпаведна, $t-t_0$ — прамежак часу, праз які мех. сістэма пераходзіць з пачатковага ў адвольны, залежны ад часу стан сістэмы. Паняцце «Дз.» выкарыстоўваецца ў аналітычнай механіцы, а пры адпаведных абагульненнях у тэорыі пругкасці, электра- і тэрмадынамікі, квантавай механіцы і тэорыі поля. Гл. таксама *Найменшага дзеяння прынцып*. *А.І.Болсун.*

ДЗЕ́ЯННЕ САЦЫЯ́ЛЬНАЕ, акт дзейнасці індывід. і калект. суб'екта па пераўтварэнні наяўных грамадскіх адносін у інш. адпаведна яго інтарэсам і мэтам. Дыферэнцыруюцца на эканам., грамадска-паліт., пазнавальныя, камунікатыўна-ідэалаг. (рэліг., эстэт., маральныя і інш.). Вылучаюць Дз.с. рэв., рэфармісцкія, прагрэс., рэакцыйныя, стыхійна-імпульсіўныя, арганізаваныя, дэструктыўныя, навацыйныя і інш. Прадстаўнікі зах. сацыялогіі засяроджваюць увагу на асобасным аспекце Дз.с., дзе ў якасці суб'ектаў разглядаюцца індывіды, якія знаходзяцца ў кантактных міжасобасных адносінах (інтэракцыях). Па асобасных крытэрыях яны падзяляюць Дз.с. на мэтарацыянальныя, каштоўнаснарацыянальныя, афектыўныя, традыцыйныя (М.Вебер), інтэлектуальныя, экспрэсіўныя, маральныя (Т.Парсанс), тэлеалагічныя, нормарэгулюючыя, драматургічныя, камунікатыўныя (Ю.Хабермас). Сацыёлагі А.Гідэнс, А.Турэн, П.Штомпке і інш. прапаноўваюць размежаваць дзейнасць структур (цывілізацый, дзяржаў і г.д.) і сац. індывіда, лічаць, што праблема Дз.с. павінна вырашацца з улікам супярэчлівага ўзаемапранікнення яго структурнага і асобаснага аспектаў, аб'ектыўнага і суб'ектыўнага момантаў грамадскага развіцця. Марксісцкая тэорыя звязвае калект. Дз.с. з аналізам зместу актыўнасці сукупнага суб'екта, яго патрэб і інтарэсаў, мэт ідэалогіі, а таксама сродкаў, спосабаў і вынікаў гэтых дзеянняў.

Літ.: Социальное действие. Мн., 1980; Штомпке П. Социология социальных изменений: Пер. с англ. М., 1996. *Ю.А.Харын.*

ДЗЕ́ЯННЯ І ПРОЦІДЗЕ́ЯННЕ ЗАКО́Н, адзін з асн. законаў механікі (трэці закон Ньютана). Гл. ў арт. *Ньютана законы механікі*.

ДЗЕЯСЛО́Ў, знамянальная *часціна мовы*, якая абазначае працэс, што адбываецца ў часе. Паняцце працэсу аб'ядноўвае прыватныя значэнні фіз. дзеяння, руху, перамяшчэння, стану, адносін, выяўлення ці змены прыкметы. У бел. мове Дз. мае формы стану, трывання, ладу, часу, асобы, ліку, зваротнасці і незваротнасці (гл. адпаведныя арт.). Дз. ўмоўнага ладу і прошлага часу абвеснага ладу маюць род — мужчынскі, жаночы, ніякі («ішоў», «ішла», «ішло»). Неспрагальныя формы Дз. — *інфінітыў, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе*. Асобную групу складаюць безасабовыя Дз. («світае», «пацяплела», «шанцуе»).

У старабел. мове закончанае і незакончанае трыванні не проціпастаўляліся, але было болей форм часу (*перфект, аорыст, плюсквамперфект*, будучы I, будучы II і інш.), якія паказвалі закончанасць ці працягласць дзеяння; часцей ужываліся дзеепрыметнікі. Словаўтварэнне Дз. у сучаснай бел. мове надзвычай багатае прэфіксацыяй («ехаць — аб'ехаць — выехаць — даехаць — з'ехаць — наехаць — недаехаць — паехаць — пераехаць — прыехаць — уз'ехаць» і г.д.). Асн. сінтаксічная роля Дз. — быць *выказнікам*. Інфінітыў, дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе выступаюць і ў ролі інш. членаў сказа. У залежнасці ад адносін да аб'екта Дз. падзяляюцца на пераходныя, якія спалучаюцца з прамым дапаўненнем («будаваць дом», «выпіць квасу», «гандляваць агародніной»), і непераходныя («ісці», «бялець», «сталярнічаць»).

Літ.: Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове. Мн., 1968; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *П.П.Шуба.*

ДЗЁБЕРАЙНЕР (Döbereiner) Іаган Вольфганг (15.12.1780, каля г. Гоф, зямля Баварыя, Германія — 24.3.1849), нямецкі хімік, адзін з заснавальнікаў хім. *каталізу*. З 1810 праф. Іенскага ун-та. Навук. працы па класіфікацыі хім. элементаў, каталізе. Адкрыў каталітычнае ўздзеянне раздробленай пла́ціны (1821—22). Зрабіў спробу класіфікацыі элементаў па іх атамных масах (т. зв. трыяды Дз.).

Літ.: Биографии великих химиков: Пер. с нем. М., 1981.

ДЗЁБЛІН (Döblin) Альфрэд (10.8.1878, г. Шчэцін, Польшча — 28.6.1957), нямецкі пісьменнік. Як ваен. ўрач удзельнічаў у 1-й сусв. вайне. У 1933—45 і з 1953 — у эміграцыі. Адзін з прадстаўнікоў ням. *экспрэсіянізму*, у рэчышчы якога напісаны раманы — філас. «Тры скачкі Ван-Луня» (1915), гіст. «Валенштэйн» (1920), утапічны «Горы, моры і гіганты» (1924). Аўтар раманаў «Гамлет, або Канец доўгай ночы» (1956), трылогіі «Амазонкі» (1937—48), тэтралогіі «Лістапад 1918» (1938—50), апавяданняў, п'ес, літ.-крытычных і публіцыстычных прац. Вяршыня творчасці — своеасаблівы «раман выхавання» — «Берлін, Александэрплац» (1929). У творах Дз. традыц. манера пісьма спалучаецца з эксперыментальнай, паглыбленасць у душэўны свет герояў з глыбокімі філас.-сімвалічнымі абагульненнямі; шырока выкарыстоўваюцца міфал. і літ. рэмінісцэнцыі і аналогіі.

Тв.: Рус. пер. — Гамлет, или Долгая ночь подходит к концу. М., 1983. *Е.А.Лявонава.*

ДЗЁГАЦЬ, прадукт сухой перагонкі драўніны, торфу, бурага і каменнага вугалю, сланцаў. Густая вадкасць бурага ці чорнага колеру. Складаная сумесь арган. рэчываў, састаў якой залежыць ад сыравіны і метадаў перапрацоўкі.

Пры паўкаксаванні (сухая перагонка пры 500—600 °С) вугалю, торфу, сланцаў утвараецца т.зв. першасны Дз., які мае (у залежнасці ад сыравіны) фенолы, насычаныя вуглевадароды, альдэгіды, кетоны і інш. арган. рэчывы. Пры *каксаванні* каменнага вугалю ўтвараецца Дз. каменнавугальны (гл. *Каменнавугальная смала*). Дз. драўняны падзяляюць на бяросты (атрымліваюць награваннем бяросты да 200—300 °С без доступу паветра), і менш якасны бярозавы (атрымліваюць разгонкай прадуктаў *піролізу драўніны* з карой). Драўняны Дз. выкарыстоўваюць пры тлушчаванні скуры, у медыцыне і ветэрынарыі (кампанент дзягцярнага мыла, розных мазей).

ДЗЁМА́Н, археалагічная культура плямён, якія ў 5-м тыс. — 3 ст. да н.э. жылі на тэр. Японіі. Назва ад асаблівага тыпу керамікі з лінейным арнаментам у большасці спіральна-крывалінейных форм (яп. «дзумон»). Насельніцтва жыло на паселішчах у лёгкіх хацінах круглай і прамавугольнай формы, займалася рыбалоўствам, паляваннем, збіральніцтвам ракавін. З 4-га тыс. да н.э. вядомы свойская жывёла, проса, грэчка. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў скурчаным ці выцягнутым становішчы ў грунтавых пахаваннях. Прылады працы выраблялі з каменю (шліфаваныя сякеры, нажы) і касцей (рыбалоўныя кручкі, гарпуны). Змянілася культурай Яёі. *А.В.Іоў.*

ДЗЁМІН Іван Міхайлавіч (н. 2.1.1915, в. Хацісіна Калужскай вобл., Расія — 13.1.1992), гаспадарчы дзеяч, адзін з арганізатараў аўтамаб. прам-сці Беларусі. Герой Сац. Працы (1975). Скончыў Маскоўскі тэкст. ін-т (1941). З 1944 на Мінскім аўтазаводзе: нам. гал. энергетыка, гал. энергетык, сакратар парткома, у 1959—74 дырэктар з-да. У 1974—82 ген. дырэктар вытв. аб'яднання «Белаўтамаз». Дзярж. прэмія СССР 1968 і 1978.

І.М.Дзёмін.

ДЗЁМІН Леў Сцяпанавіч (н. 11.1.1926, Масква), савецкі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1974), лётчык-касманаўт (1974), палкоўнік, канд. тэхн. н. (1963). Скончыў Ваенна-паветр. інж. акадэмію імя М.Я.Жукоўскага (1956). У 1963—78 у атрадзе касманаўтаў. 26—28.8.1974 з Г.В.*Сарафанавым* здзейсніў (як бортінжынер) палёт на касм. караблі «Саюз-15». Правёў у космасе 2,2 сут.

ДЗЁМКІНА Вольга Васілеўна (н. 30.4.1953, в. Забаенне Лепельскага р-на Віцебскай вобл.), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла Рэсп. школу-інтэрнат па музыцы і выяўл. мастацтве (1971), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1977). Працуе на Мінскім вытв.-маст. камбінаце (з 1979). У тэхніцы габелену стварае творы на тэмы бел. мінуўшчыны («Рэха», 1977, «Песня з мінулых стагоддзяў», 1978, «Ветразь міру», 1986, «На строме часу», 1986, «Малітва», 1992), чарнобыльскай трагедыі («Чорная быліна пра ненароджаных дзяцей Палесся», «Крыніца часу», абедзве 1989, «Узыходжанне», 1990, «Зорка Палын», 1991, «Таямніца святла», 1995), космасу і сусвету («Пакланенне зоркам», 1992, «Песня вятроў», 1996). У работах «Дажынкі», «Гуканне вясны», «Купалле», «Паганскія сімвалы», «Гімн лілеям» (усе 1990-я г.) тактоўная спроба расшыфраваць знакавую сістэму бел. арнаменту. Стварыла сцэн. касцюмы для ансамбляў «Песняры», «Жалейка», «Зорачка», «Купалінка» і інш. Іл. гл. таксама да арт. *Батык, Габелен.*

Літ.: Фатыхава Г. Зорка Палын // ЛіМ. 1996. 26 крас.; Яе ж. Музыка габелена // Беларусь. 1996. № 10. *Г.А.Фатыхава.*

ДЗЁНІЦ (Dönitz) Карл (16.9.1891, Берлін — 24.12.1980), ваенна-марскі дзеяч фаш. Германіі, адзін з гал. нацысцкіх ваен. злачынцаў 2-й сусв. вайны. Гросадмірал (1943). У ВМФ з 1910. У 1936—43 камандуючы падводнымі сіламі, у 1943—45 галоўнакамандуючы ВМФ: выступаў за вядзенне неабмежаванай падводнай вайны. У маі 1945 паводле завяшчання А.Гітлера рэйхсканцлер і вярх. галоўнакамандуючы. Урад Дз. арганізаваў капітуляцыю Германіі перад дзяржавамі антыгітлераўскай кааліцыі. 23.5.1945 арыштаваны за злачынствы супраць міру і парушэнне прававых норм вядзення вайны, асуджаны на 10 гадоў зняволення.

Тв.: Рус. пер. — Немецкие подводные лодки во второй мировой войне. М., 1964; Двадцать дней на посту главы государства // Новая и новейшая история. 1991. № 6.

ДЗЁННІК, штодзённыя або перыядычныя запісы (звычайна датаваныя), якія адлюстроўваюць падзеі жыцця аўтара на фоне рэчаіснасці; літаратурна-бытавы жанр. Запісы часта вызначаюцца па гарачых слядах падзей. Дз. найчасцей пішацца для сябе і не разлічаны на публічнае прачытанне (за выключэннем літ. Дз.).

З'яўляюцца своеасаблівымі гісторыка-культ. дакументамі (Дз. мараплаўца Дж.Кука, ліцэйскі Дз. дзекабрыста В.К.Кюхельбекера, публіцыста А.С.Суворына, пісьменнікаў В.Скота, Стэндаля, Т.Шаўчэнкі, Ф.Дастаеўскага, Л.Талстога, А.Чэхава і інш.). Пэўнымі дзённікавымі асаблівасцямі вызначаюцца некаторыя творы стараж. бел. л-ры: «Дзённік» Фёдара Еўлашоўскага (канец 16 — пач. 17 ст.), дыярыушы А.Філіповіча, С. і Б.Маскевічаў, якія грунтаваліся на папярэдніх дзённікавых запісах. Элементы Дз. часта маюць падарожныя запісы і лісты, што тлумачыцца іх хранікальнасцю: мемуары А.Абуховіча (канец 19 ст.), «Лісты з дарогі» Ядвігіна Ш. (1910), «Успаміны з паездкі ў Фінляндыю» Цёткі (1914). Пісьменніцкія Дз., нават калі не становяцца літ. творамі, маюць літ.-гіст. значэнне і з'яўляюцца каштоўным матэрыялам для даследавання жыццёвага і творчага шляху пісьменніка, вытокаў і псіхалогіі яго творчасці (дзённікавыя запісы 1902—03, «На схіле дзён», 1945—51, Я.Коласа; «Лісткі календара», 1932—39, М.Танка; ваен. Дз. 1941—43 І.Мележа і інш.). Часта Дз. выступае як жанравая разнавіднасць дакумент. і маст. прозы, можа быць блізкі да твораў аўтабіяграфічнага жанру. *В.І.Атрашкевіч.*

ДЗЁННЫЯ ДРАПЕ́ЖНЫЯ ПТУ́ШКІ, гл. *Сокалападобныя.*

ДЗЁРАН, верхні слой глебы, густа перапляцены жывымі і адмерлымі каранямі, парасткамі і карэнішчамі шматгадовых траў. Фарміруецца пад травяністай расліннасцю ў выніку дзярновага глебаўтваральнага працэсу на аблогах, поймавых і сухадольных лугах і пашы, забалочаных глебах. Мае павышаную колькасць пажыўных рэчываў (асабліва азотных) і большую звязнасць у параўнанні з ніжняй часткай перагнойнага гарызонту. Дз., ці д з я р н і н а й называюць таксама выразаныя пласты з парослага травою верхняга слоя глебы, якімі ўмацоўваюць адхоны, схілы і інш.

ДЗЁРНАВІЧЫ, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., на правым беразе р. Дрыса. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 45 км на У ад Верхнядзвінска, 150 км ад Віцебска, 12 км ад чыг. ст. Боркавічы. 469 ж., 208 двароў (1997).

В.Дзёмкіна. Чорная быліна пра ненароджаных дзяцей Палесся. 1989.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ДЗІБІЧ-ЗАБАЛКА́НСКІ Іван Іванавіч (Іаган Карл Фрыдрых Антон; 13.5.1785, Гросляйпэ, Сілезія, цяпер Вроцлаўскае ваяв., Польшча — 10.6.1831), генерал-фельдмаршал рас. арміі (1829). З сям'і прускага афіцэра Дзібіча, які ў 1798 перайшоў на службу ў рас. армію. Вучыўся ў Берлінскім кадэцкім корпусе, у 1801 пераведзены на службу ў Расію. Удзельнік вайны з Францыяй у 1805—07, замежных паходаў рас. арміі ў 1812—13. У 1823—24 нач. Гал. штаба. Кіраваў арыштамі дзекабрыстаў у 2-й арміі. У час руска-турэцкай вайны 1828—29 кіраваў ваен. дзеяннямі на

Балканах, за што атрымаў дадатак да прозвішча — Забалканскі. Выступаў супраць нац.-вызв. вайны на Балканах. Са снеж. 1830 галоўнакамандуючы войскамі супраць *паўстання 1830—31.*

У.М.Міхнюк.

ДЗІ́ВА, рака ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл. (бас. Зах. Дзвіны). Даўж. 29 км. Пл. вадазбору 631 км^2. Выцякае з воз. Урада, цячэ ў межах Ушацка-Лепельскага ўзв., працякае цераз азёры Атолава, Турасы, Бярозаўскае і Павульскае, упадае ў воз. Янова. Каля 12% вадазбору Дз. прыпадае на 130 азёр Ушацкай групы. Пры выхадзе з кожнага возера на некаторай адлегласці рака не замярзае ў самы моцны мароз, а над вадой стаіць пара.

ДЗІ́ВАВА ПЯЧО́РА, карставая вапняковая пячора на зах. схіле Паўн. Урала, у даліне р. Колва (бас. Камы), у Пермскай вобл. Расіі. Агульная даўж. галерэй 9,7 км. Вядома 59 гротаў (Бетлан, Дзева, Гваздзецкага і інш.). Ёсць ручай і 9 невял. азёр. Шматлікія нацечныя ўтварэнні. Вядома з 18 ст. Спелеатурызм.

Дзіванна звычайная.

ДЗІВА́ННА (Verbascum), род кветкавых раслін сям. залознікавых. Каля 350 відаў. Пашыраны пераважна ў Міжземнамор'і. Як пустазелле або здзічэлыя трапляюцца ў Паўн. і Паўд. Амерыцы, у Аўстраліі. На Беларусі 7 дзікарослых відаў: Дз. звычайная, або мядзведжае вуха (V. thapsus), чорная (V. nigrum), мучністая (V. lychnitis), густакветная (V. densiflorum), фіялетавая (V. phoeniceum), лекавая (V. phlomoides), тараканавая (V. blattaria). Растуць на сухіх пясчаных сонечных месцах, у светлых лясах і інш. Дз. джунгарская (V. songoricum) інтрадукавана як лек. расліна Цэнтр. бат. садам Нац. АН Беларусі.

Адна-, двух- і шматгадовыя пераважна густа апушаныя травяністыя расліны з высокімі прамастойнымі простымі ці галінастымі сцёбламі, рэдка паўкусты. Лісце чаргаванае або папарна збліжанае, цэласнае, рэдка перыстараздзельнае. Кветкі з 5 пялёсткамі, звычайна жоўтыя, рэдка фіялетавыя, адзіночныя ці ў простых (гронках ці каласах) або складаных (мяцёлчатых, коласа- ці гронкападобных) суквецці. Плод — каробачка. Лек., дэкар. і фарбавальныя расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДЗІВАСІ́Л (Inula), род кветкавых раслін сям. астравых. Каля 150 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Азіі і Афрыцы. На Беларусі 3 дзікарослыя віды: Дз. брытанскі (I. britannica), вербалісты (I. salicina), цвёрдаваласісты (I. hirta). Растуць па берагах рэк і вадаёмаў, у хмызняках, на лугах, палянах і высечках. Як лек. і дэкар. расліну вырошчваюць Дз. высокі, або дзікі сланечнік (I. helenium), які трапляецца, і здзічэлы. З інтрадукаваных найб. вядомыя: Дз. германскі (I. germanica), мечалісты (I. ensifolia), цудоўны (I. magnifica) і шурпаты (I. aspera).

Шмат-, радзей двух- і аднагадовыя травяністыя расліны з галінастым, у верхняй ч. раўнамерна аблісцелым голым або апушаным сцяблом. Лісце чаргаванае, суцэльнае, цэльнакрайняе ці зубчастае. Кветкі жоўтыя, сабраныя ў адзіночныя або шматлікія, у шчытападобных суквецці кошыкі. Плод — сямянка. Лек., кармавыя, меданосныя, дэкар. і фарбавальныя расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДЗІ́ВІН, вёска ў Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл., каля воз. Любань. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 33 км на ПдУ ад горада і 36 км ад чыг. ст. Кобрын, 78 км ад Брэста. 4295 ж., 1591 двор (1997).

Вядомы з 16 ст. як мястэчка Брэсцкага ваяв. ВКЛ. У 1566 — 184 двары. З 1795 у Рас. імперыі, у 19 — пач. 20 ст. ў Кобрынскім пав. Гродзенскай губ. У 1878 — 2490 ж., 2 царквы, сінагога, 2 кірмашы на год. У 1921—39 у Польшчы, мястэчка ў Палескім ваяв. З 1939 у БССР, у 1940—59 вёска, цэнтр *Дзівінскага раёна*, больш за 4 тыс. жыхароў. У Вял. Айч. вайну з 24.6.1941 да 21.7.1944 акупіраваны ням.-фаш. войскамі, якія загубілі ў Дз. і раёне 2819 чал. З 1959 у Кобрынскім р-не. У 1971 — 4877 ж., 1407 двароў.

«Сельгасхімія», агароднінасушыльны з-д, тэкст.-вытв. аб'яднанне, пякарня, лясніцтва. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, 2 дамы культуры, 3 б-кі, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры — *Дзівінская царква Параскевы Пятніцы* (1740), Прачысценская царква (пач. 20 ст.). Каля вёскі стаянка мезаліту і неаліту і паселішча бронзавага веку.

ДЗІ́ВІНСКАЯ Валянціна Гаўрылаўна (н. 10.2.1936, в. Лемяшы Жытомірскай вобл., Украіна), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла Ленінградскае вышэйшае маст.-прамысл. вучылішча (1967). У 1967—84 працавала на шклозаводзе «Нёман» (г.п. Бярозаўка Лідскага р-на). Працуе ў гутнай тэхніцы, пераважна ў каляровым шкле. Сярод твораў: наборы посуду «Паўночныя матывы», «Карункі»; кампазіцыі «Дуброва», «Эцюд», «Сосны»; блюды «Мак і васількі», «Леў», «Коннік»; дэкар. камплекты «Вясна», «Ружы» і інш. Работы вылучаюцца выяўл. вобразнасцю, сакавітасцю формаў. З 1984 у С.-Пецярбургу.

ДЗІ́ВІНСКАЯ ЦАРКВА́ ПАРАСКЕ́ВЫ ПЯ́ТНІЦЫ, помнік драўлянага дойлідства 18 ст. з элементамі стылю барока. Пабудавана ў 1740 у в. Дзівін Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.

Асноўны прамавугольны зруб і 5-гранная апсіда з нізкімі рызніцамі накрыты агульным дахам з навісямі на

Дзівасіл брытанскі.

В.Дзівінская. Кампазіцыя «Дуброва». 1971.

месцы злучэння зрубаў. На гал. фасадзе тарэц 2-схільнага даху вырашаны як спалучэнне франтона і атыкавай устаўкі з паўвальмай паміж 2 чацверыковымі вежамі. Гал. фасад падзелены галерэяй з балюстрадай. Інтэр'ер зальны з плоскай столлю. З боку ад царквы званіца (васьмярык на чацверыку, 2-я пал. 19 ст.), накрытая шатром. *Т.В.Габрусь.*

Дзівінская царква Параскевы Пятніцы.

ДЗІ́ВІНСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1940—59. Утвораны 15.1.1940 у Брэсцкай вобл. Цэнтр — в. *Дзівін*. Пл. 1 тыс. км^2. 12.10.1940 падзелены на 11 сельсаветаў. 8.8.1959 скасаваны, тэрыторыя перададзена ў Кобрынскі, Драгічынскі і Маларыцкі р-ны.

ДЗІГА́Н Яфім Львовіч (14.12.1898, Масква — 21.12.1981), расійскі кінарэжысёр. Нар. арт. СССР (1973). Засл. дз. маст. Расіі (1958). Скончыў кінашколу імя Б.Чайкоўскага ў Маскве. Творчую дзейнасць пачаў у 1928 на кінастудыі «Дзяржкінапрам» Грузіі фільмам «Першы карнет Стрэшнеў» (разам з М.Чыяўрэлі). У 1929—34 на кінастудыі «Савецкая Беларусь» у Ленінградзе, дзе зняў дакумент. («Май калгасны», 1930, «На штурм», 1931) і маст. («Суд павінен працягвацца», 1931, «Жанчына», 1932) фільмы. Майстар жанру гіст.-рэв. эпапеі: «Мы з Кранштата» (1936, Дзярж. прэмія СССР 1941), «Пралог» (1956), «Жалезны паток» (1967). З 1937 выкладаў ва Усесаюзным ін-це кінематаграфіі ў Маскве (з 1965 праф.).

ДЗІ́ДА, старажытная колючая зброя; род лёгкага *кап'я* або *пікі* з металічным наканечнікам, насаджаным на доўтае цаўё. Падобную паляўнічую прыладу наз. таксама дзідка, рагаціна.

ДЗІДА́КНА (Didacna), род малюскаў сям. лімнакардыід кл. двухстворкавых. Жывуць толькі ў Каспійскім м. (эндэмікі) у мелкаводнай прыбярэжнай зоне, на пясчаных і заглееных грунтах на глыб. каля 50 м. Найб. звычайныя D. trigonoides, D. protracta, D. barbot de marnyi, D. crassa. Рэлікты сармацкай фауны.

Ракавіна (даўж. да 6 см) трохвугольнаавальная або авальная з плоскімі радыяльнымі рэбрамі, з 2 (радзей 1) кардынальнымі зубамі. Біяфільтратары.

ДЗІДЗЁНКА Рыгор Васілевіч (13.2.1917, в. Навапаўлаўка Уральскай вобл., Казахстан — 26.8.1972), бел. артыст эстрады. Засл. арт. Беларусі (1963). Скончыў Варонежскае тэатр. вучылішча (1938). У 1938—41 чытальнік Ансамбля песні і танца пагранвойск БССР. З 1947 у Белдзяржфілармоніі, артыст размоўнага жанру. Аўтар і выканаўца сатыр. куплетаў, мініяцюр, фельетонаў.

ДЗІ́ДЗІ ЦУСІ́Н, інфарм. агенцтва Японіі, другое (пасля *Kioda Цусін*) па велічыні і значэнні. Засн. ў 1945 у Токіо на акцыянерных пачатках. Распаўсюджвае ўнутр. (эканам., паліт., спарт.) і міжнар. інфармацыю ўласных карэспандэнтаў і замежных агенцтваў. Абменьваецца інфармацыяй з Рэйтэр, ЮПІ, АФП, ІТАР—ТАСС, Сіньхуа і інш. агенцтвамі. Абслугоўвае 124 японскія і 28 замежных газетных выдавецтваў, радыё- і тэлестанцый (1992). Выдае 2 штотыднёвікі, інфарм. бюлетэні на спец. тэмы. Мае 80 аддзяленняў у краіне і 25 за яе межамі (1992). *Т.А.Меляшкевіч.*

ДЗІДЗІЧЁНКА Ірына Дзянісаўна (н. 22.8.1936, С.-Пецярбург), бел. артыстка балета. Засл. арт. Беларусі (1964). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1955). Працавала ў т-рах Чэлябінска і Новасібірска. У 1959—75 . салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Яркая характарная танцоўшчыца, валодала выразнай пластыкай, моцным сцэн. тэмпераментам.

Сярод партый: Мадэрнісцкая танцоўшчыца і'Карчмарка («Мара», «Выбранніца» Я.Глебава), Марта («Святло і цені» Г.Вагнера), Мерседэс і Вулічная танцоўшчыца («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Анітра («Пер Гюнт» на муз. Э.Грыга), Каляровая дзяўчына («Сцежкаю грому» К.Караева), Маўрытанка і Іспанка («Балеро» на муз. М.Равеля), фея Карабос («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), танцы — індускі («Баядэрка», Мінкуса), іспанскі, венгерскі («Лебядзіная возера» Чайкоўскага), сарацынскі («Раймонда» А.Глазунова), іспанскі танец, мазурка («Папялушка» С.Пракоф'ева), кракавяк («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), гадзітанскі, этрускі («Спартак» А.Хачатурана), а таксама ў операх «Князь Ігар» А.Барадзіна, «Хаваншчына» М.Мусаргскага, «Кармэн» Ж.Бізэ. *А.І.Каляднэнка.*



Дзідакна: 1 — trigonoides; 2 — protracta.

ДЗІДЛО́ (Didelot) Шарль (Карл) Луі (1767, Стакгольм — 19.11.1837), французскі артыст балета, балетмайстар, педагог. Вучыўся ў Парыжы. Працаваў з Ж.Ж.*Наверам* і Ж.*Дабервалем*. Выкананне Дз.-танцоўшчыка вылучалася чысцінёй рухаў, грацыёзнасцю, пластычнасцю. З 1788 балетмайстар у Лондане, Парыжы, Ліёне, у 1796—1801 і 1812—15 танцоўшчык і балетмайстар Каралеўскага т-ра ў Лондане. У 1801—29 (з перапынкамі) працаваў у Пецярбургу,

Ш.Дзідло. Мастак В.Баранаў.

паставіў больш за 40 балетаў і дывертысментаў (у т.л. «Каўказскі нявольнік, або Цень нявесты» К.Каваса паводле А.Пушкіна, 1823). Распрацаваў жанр гісторыка-гераічнага балета. Яго харэаграфічныя драмы эпохі перадрамантызму характарызаваліся драматург. логікай і стылявым адзінствам, узбагачэннем тэхнікі танца. Наватарская дзейнасць Дз. сіпрыяла вылучэнню рус. балета на адно з першых месцаў у Еўропе. Сярод вучняў А.*Істоміна*, М.Данілава, К.Целяшова, А.Ліхуціна, М.Гольц.

ДЗІДО́ (Didot), сям'я франц. кнігавыдаўцоў і кнігадрукароў. Найб. вядомыя прадстаўнікі: Франсуа (1689—1757 або 1759), заснавальнік кнігавыдавецкай прыватнай фірмы Парыж (з 1713) і друкарскай (з 1754) справы. Франсуа Амбруаз (1730—1804), сын Франсуа. Вынаходнік веленевай паперы, першы выдавец франц. класічнай л-ры; шмат зрабіў для ўдасканалення друкарскага станка. П'ер Франсуа (1732—93), сын Франсуа. Словалітчык, друкар, пераплётчык, уладальнік папяровай ф-кі. Фірмэн (1764—1836), унук Франсуа. Стваральнік друкарскай сістэмы вымярэнняў элементаў шрыфту, наборных формаў (тыпаметры), гіпсавай стэрэатыпіі і розных шрыфтоў, якімі карысталіся ўсе краіны Еўропы. Выступаў і як перакладчык вершаў Вергілія і Тэакрыта. За заслугі

Фірмэна род Дзідо ў 1887 атрымаў прозвішча Фірмэн-Дзідо. Выдавецкая і кнігагандл. фірма «Фірмэн-Дзідо» існуе ў Францыі і сёння. *Т.А.Меляшкевіч.*

ДЗІДРО́ (Diderot) Дэні (5.10.1713, г. Лангр, Францыя — 31.7.1784), французскі філосаф-асветнік, пісьменнік, тэарэтык мастацтва. Заснавальнік і рэдактар «Энцыклапедыі, або Тлумачальнага слоўніка навук, мастацтваў і рамёстваў» (т. 1—35; 1751—80). У філас. творах «Думкі пра тлумачэнне прыроды» (нап. 1754), «Размова Д'Аламбера з Дзідро» (нап. 1769, выд. 1830), «Філасофскія асновы матэрыі і руху» (нап. 1770) сцвярджаў адзінства матэрыі і руху, падкрэсліваў дыялект. ўзаемасувязь і вечную зменлівасць прыродных формаў; з узаемадзеяння элементаў матэрыі, якія з'яўляюцца носьбітамі адчуванняў, узнікае мысленне, адзіная свядомасць чалавецтва і сусвету. У паліт. сферы Дз. абапіраўся на тэорыю «грамадскага дагавору», выступаў супраць саслоўнай няроўнасці і дэспатызму, надзеі на стварэнне справядлівага грамадскага ладу звязваў з асвечаным манархам, пазней схіляўся да рэсп. формы праўлення.

Д.Дзідро.

У галіне этыкі быў адным са стваральнікаў тэорыі «разумнага эгаізму», лічыў сябелюбства найважнейшым матывам паводзін людзей. Як тэарэтык эстэтыкі сутнасць прыгожага выводзіў з суадносін індывід. пачуццёвага вопыту і логікі розуму. У тэорыі мастацтва гал. лічыў прынцып натуральнасці, «праўды натуры», дзе ідэалам выступае жывая прырода, абараняў ідэі адзінства дабра і прыгажосці. Асн. творы, у якіх выказаны эстэт. погляды Дз.: «Трактат аб прыгожым» (1751), «Салоны» (нап. 1759—81), «Вопыт аб жывапісе» (1765), «Парадокс пра акцёра» (нап. 1773—78). Аўтар маст. твораў: «Манашка» (нап. 1760, выд. 1796), «Пляменнік Рамо» (1762—79, на ням. мове ў пер. І.В.Гётэ ў 1805, на франц. 1823), «Жак-фаталіст і яго гаспадар» (1773, выд. на ням. мове 1792, на франц. 1796). *В.А.Салееў.*

ДЗІЕ́ВАС, Дзіеўс, Дзіеў, у балтыйскай міфалогіі абазначэнне бажаства і гал. з багоў. Дз. стаіць над усімі багамі, але звычайна ён пасіўны і непасрэдна не ўплывае на лёсы людзей. У яго ёсць памочнікі (адзін з іх грамавержац Пяркунас) і дзеці.

ДЗІК, вепр, вяпрук (Sus scrofa), млекакормячае сям. свіных атр. парнакапытных. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы; акліматызаваны ў Амерыцы. Жыве ў разнастайных мясцінах, на Беларусі — па ўсёй тэрыторыі (26—36 тыс. у 1990 —95). Трымаецца невял. статкамі, старыя самцы (секачы) і самкі з парасятамі — паасобку. Адзін з родапачынальнікаў свойскіх свіней.

Даўж. да 2 м, маса да 300 кг. Афарбоўка ад светла-бурай або шэрай да амаль чорнай. Парасяты паласатыя. Цела ўкрыта пруткім, доўгім шчаціннем з падшэрсткам. Галава вялікая, клінападобна выцягнутая наперад. Вушы доўгія і шырокія, вочы маленькія, рыла доўгае з лычом. Верхнія і ніжнія іклы вял., у самцоў (6—10 см) загнутыя ўверх і ў бакі. Усёедны. Нараджае ў сярэднім 4—6 парасят, зрэдку да 12. Аб'ект промыслу.

Л.В.Кірыленка.

ДЗІКАБРА́ЗЫ, млекакормячыя 2 сям. атр. грызуноў. Сям. дзікабразавых (Hystricidae). 4 роды, 11 відаў. Пашыраны ў Афрыцы, Паўд. Еўропе, Пярэдняй, Сярэдняй і Паўд. Азіі. Жывуць у пустынных, горных, перадгорных раёнах. Найб. вядомы Дз. індыйскі (Hystrix indica); рэшткі блізкага да яго віду выяўлены ў ніжнеантрапагенных адкладах каля в. Карчова (Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.). Сям. Дз. амерыканскіх (Erethizontidae) — 5 родаў, 12 відаў. Пашыраны ў Паўн., Цэнтр і паўн. ч. Паўд. Амерыкі. Жывуць пераважна на дрэвах. Вядомы Дз. мексіканскі (Coendou mexicanus).

Даўж. цела да 103 см, хваста да 45 см, маса да 27 кг. Цела ўкрыта тоўстымі вострымі іголкамі (даўж. на загрыўку да 40 см) і цвёрдым шчаціннем. Афарбоўка цела чарнаватая, бураватая, карычневая з жоўтымі або белымі палосамі на іголках і валасах. Корм раслінны. Нараджаюць 1—4 дзіцянят.

ДЗІКАЕ, гідралагічны заказнік рэсп. значэння на тэр. Пружанскага р-на Брэсцкай і Свіслацкага р-на Гродзенскай абласцей. Створаны ў 1968 з мэтай зберажэння ў натуральным стане асн. ч. *Дзікага балота*, а таксама для падтрымання гідралагічнага рэжыму прылеглай ч. *Белавежскай пушчы*. Пл. 7,4 тыс. га (1997). Знаходзіцца ў межах Нараваясельдзінскай раўніны. Займае ч. стараж. праточнай даліны на водападзеле Балт. і Чарнаморскага басейнаў. У флоры заказніка больш за 150 відаў, ёсць рэдкія ахоўныя віды: арніка горная, венерын чаравічак сапраўдны, зубніца клубняносная, лілея-саранка і інш. Тарфяныя паклады сярэдняй глыб. 1,4 м пераважна з драўнянага (найчасцей бярозавага) торфу, укрытага асаковым і часткова асакова-гіпнавым. У глыбокіх западзінах сапрапелі (магутнасць пластоў да 0,6 м). На балотным масіве зрэдку трапляюцца мінер. «астраўкі» з шыракалістых і шыракаліста-хвойных лясоў. *П.І.Лабанок.*

Дзік: 1 — самец; 2 — галава самкі; 3 — парася.

ДЗІКАЕ БАЛО́ТА, на ПнУ Глускага р-на Магілёўскай вобл., на водападзеле р. Пціч і яе прытока р. Ліса. Вярховага, нізіннага і мяшанага тыпаў. Пл. 1,7 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 1,4 тыс. га. На балоце воз. Дзікае. Глыб. торфу да 6,5 м, сярэдняя 2,7 м. Ёсць сапрапелі. На вярховых участках пераважае дрэвава-хмызняковая расліннасць з хвоі, бярозы, вольхі, на нізінных — асокі і імхі.

ДЗІКАЕ БАЛО́ТА, у Пружанскім р-не Брэсцкай вобл. і Свіслацкім р-не Гродзенскай вобл., у вадазборы рэк Ясельда і Нараў. Нізіннага тыпу. Пл. 21,7 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 18,3 тыс. га. Глыб. торфу да 3,6 м, сярэдняя

1

2

Дзікабразы: 1 — індыйскі; 2 — мексіканскі.

1,4 м. Балота пераважна пад хмызняком, часткова пад лесам, месцамі асаковае покрыва. Частка балота ў межах гідралагічнага заказніка *Дзікае*. На асушаных землях сеюць пераважна травы.

ДЗІКАЕ ВО́ЗЕРА, у Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Трэмля (левы прыток Прыпяці), за 35 км на ПнУ ад г. Петрыкаў. Пл. 0,78 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 800 м, даўж. берагавой лініі каля 3 км. Схілы катлавіны выш. да 1 м, спадзістыя, парослыя хмызняком. Берагі забалочаныя, пад хмызняком, месцамі сплавінныя.

ДЗІКАЕ ВО́ЗЕРА, у Глускім р-не Магілёўскай вобл., у бас. р. Пціч, за 13 км на ПнУ ад г.п. Глуск. Пл. 0,28 км^2. Дно выслана сапрапелем. Злучана ручаём з р. Ліса.

ДЗІКАЕ ПО́ЛЕ, гістарычная назва тэр. паміж Донам, верхняй Акой і левымі прытокамі Дзясны і Дняпра. Аддзяляла Рус. дзяржаву ад Крымскага ханства. Асвоена ў 16—17 ст. рус. сялянамі, якія ўцякалі ад феад. эксплуатацыі і дзярж. павіннасцей.

ДЗІКАЯ ПРЫРО́ДА, участкі прыроднага асяроддзя, не парушаныя гасп. дзейнасцю чалавека, на якія ён уплывае толькі як біял. істота або апасродкавана праз глабальныя змены на Зямлі. Паняцце Дз.п. адноснае ў сувязі з хуткім пашырэннем і інтэнсіфікацыяй антрапагеннага ўздзеяння на прыроду ва ўсім свеце і тым, што яго вынікі фіксуюцца практычна ў любым з куткоў Зямнога шара. Беларусь практычна ўся знаходзіцца ў зоне такога ўплыву. Эталонныя ўчасткі яе вылучаюцца і ахоўваюцца ў якасці *помнікаў прыроды*, уваходзяць у склад *заказнікаў*, *запаведнікаў*, выкарыстоўваюцца для арганізацыі *маніторынгу*.

ДЗІКАЯ ПЯТРУ́ШКА (Peucedanum), род кветкавых раслін сям. сельдэрэевых. Каля 120 відаў. Пашыраны ў субтрапічных, умераных і субарктычных абласцях Еўропы, Азіі, у трапічнай і Паўд. Афрыцы. На Беларусі 3 віды: Дз.п. горная (P. oreoselinum) — расце ўсюды ў хваёвых і мяшаных лясах, на ўзлесках; аленевая (P. cervaria) — трапляецца рэдка ў паўд. і зах. частках краіны, занесена ў Чырв. кнігу; настуркавая, або цар-зелле (P. ostruthium) — у наваколлі Мінска, Гродна і Магілёва.

Шматгадовыя травяністыя расліны з простым або галінастым сцяблом і верацёнападобным патоўшчаным коранем. Лісце трайчастае або перыстае, прыкаранёвае чаранковае. Кветкі дробныя, белыя, жоўтыя або чырванаватыя, у складаных парасоніках. Плод — віслаплоднік. Лек., харч. і дэкар. расліны.

Г.У.Вынаеў.

Дзікая пятрушка.

ДЗІКАЯ РАБІ́НКА, гл. ў арт. *Піжма*.

Ч.Дзікенс.

ДЗІ́КЕНС (Dickens) Чарлз (7.2.1812, г. Портсмут, Вялікабрытанія — 9.6.1870), англійскі пісьменнік. Вучыўся ў прыватнай школе, працаваў клеркам, парламенцкім стэнографам, рэпарцёрам. Шырокую вядомасць прынёс яму першы твор «Нарысы Боза» (1833—36). Серыя спарт. нарысаў пра дзівака і няўдачніка містэра Піквіка ператварылася ў камічную эпапею — раман «Пасмяротныя запіскі Піквікскага клуба» (1837). У раманах «Прыгоды Олівера Твіста» (1838), «Жыццё і прыгоды Нікаласа Нікльбі» (1839) адлюстраваў занепад духоўнасці і маралі ў віктарыянскай Англіі; сац. праблемы разглядаліся ў іх сувязі з маральна-этычнымі, праз крытэрыі дабра і зла. Традыцыі «рамана выхавання», рэаліст. асэнсаванне рэчаіснасці, увага да вечных маральных праблем характэрны для раманаў «Домбі і сын» (1848) і «Дэвід Коперфілд» (аўтабіяграфічны, 1849—50). Паглыбленне ў сутнасць жыцця адбывалася разам з узмацненнем сімволікі і сатыр. трактоўкі вобразаў у раманах «Халодны дом» (1853), «Цяжкія часы» (1854), «Крошка Дорыт» (1857). Аўтар гіст. рамана «Барнабі Радж» (1841), сац.-псіхал. раманаў з элементамі дэтэктыва «Вялікія спадзяванні» (1861), «Наш агульны сябар» (1865), «Таямніца Эдвіна Друда» (1870, незакончаны). На бел. мове выдадзены раманы Дз. «Домбі і сын» (1938) і «Вялікія спадзяванні» (1940). Паводле яго твораў т-р імя Я.Коласа паставіў спектакль «Жорсткі свет» (1953).

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—30. М., 1957—63.

Літ.: Сильман Т. Диккенс: Очерки творчества. Л., 1970; Уилсон Э. Мир Чарльза Диккенса. М., 1975.

Г.Я.Адамовіч.

ДЗІКІ Аляксей Дзянісавіч (25.2.1889, г. Днепрапятроўск, Украіна — 1.10.1955), расійскі рэжысёр, акцёр, педагог. Нар. арт. СССР (1949). Праф. (1948). З 1910 у МХТ, з 1911 у 1-й студыі МХТ (пазней МХТ 2-і); у 1944—52 у Малым т-ры. Пастаўленыя ім спектаклі вызначаліся выразнасцю, сакавітасцю фарбаў, гумарам, жыццялюбствам, філас. глыбінёй: «Блыха» (1925) і «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» (1935) паводле М.Ляскова, «Глыбокая правінцыя» М.Святлова (1935), «Цені» М.Салтыкова-Шчадрына (1953). Педагог яўр. секцыі Бел. драм. студыі ў Маскве. Кіраўнік пастаноўкі «Недарэчнасць» К.Фіна ў БДТ-2 і кансультант пастаноўкі «Гісторыя пяці хвастоў» Л.Левіна ў БДТ-3 (1934). Здымаўся ў кіно: «Адмірал Нахімаў», «Кутузаў» і інш. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1947, 1949 (двойчы), 1950.

ДЗІКІ ВІНАГРА́Д (Vitis sylvestris), лясны вінаград, дзікі еўрап.-азіяцкі від вінаграду. Паводле інш. уяўленняў, падвід або форма вінаграду культурнага — звычайнага (V. vinifera) ці яго здзічэлая форма, магчыма, продак. Пашыраны ў Сярэдняй і Паўд. Еўропе, Закарпацці, Прыднястроўі, Крыме, на Каўказе, у Малой, Сярэдняй і Зах. Азіі. Расце дзіка ў далінах рэк, поймавых лясах, у хмызняках і на камяністых схілах.

Двухдомная лістападная ліяна або куст, які сцелецца, з лазячымі парасткамі даўж. да 10 м і дыям. 10—15 см, укрытымі буравата-шэрай карой. Лісце амаль цэласнае, 3—5-лопасцевае, круглаватае, ныркападобнае, па краі няроўна буйназубчастае, на чаранках. Кветкі дробныя, зеленаватыя, сабраныя ў складаныя мяцёлчатыя суквецці. Плод — чорная, з шызым налётам, зрэдку белая ягада. Харч., вітамінаносная расліна, выкарыстоўваецца ў селекцыі культ. сартоў вінаграду. Дз. в. часам наз. расліны з роду дзявочы вінаград.

Г.У.Вынаеў.

ДЗІКІ НІКАР, балота на ПнЗ Пружанскага р-на Брэсцкай вобл., у вадазборы канала Нараўка (зарэгуляваны прыток р. Нараў). Нізіннага тыпу. Пл. 7,2 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 5,7 тыс. га. Глыб. торфу да 3,2 м, сярэдняя 1,3 м. Частка балота ў межах *Белавежскай пушчы*. На тэр. пушчы балота не асушана, пераважаюць гіпнава-асаковыя асацыяцыі, месцамі драбналессе з хвоі, вольхі і бярозы. Сярод балота адзіны на Беларусі ўчастак лесу з белай піхты. Астатняя ч. асушана, пад ворывам і сенажаццю.

ДЗІКІ СЛАНЕ́ЧНІК, гл. ў арт. *Дзівасіл*.

ДЗІКІНСАН (Dickinson) Эмілі Элізабет (10.12.1830, г. Амхерст, штат Масачусетс, ЗША — 15.5.1886), амерыканская паэтэса. Вучылася ў жаночым каледжы; з 1854 у добраахвотным пустэльніцтве ў Амхерсце. Напісала каля 2000 вершаў, але дала дазвол апублікаваць толькі 7 (надрук. 5). Завяшчала знішчыць свой архіў, але ў 1890 выдадзена яе паэт. кн.

«Вершы». Цікавасць да творчасці і асобы Дз. зноў узнікла ў 1910-я г. ў часы т. зв. «паэтычнага Рэнесансу» ў ЗША. Асн. тэмы яе творчасці — каханне, жыццё і смерць, прырода. Эксперыментавала з мовай (насычала яе неалагізмамі), адыходзіла ад традыц. граматыкі і сінтаксісу. Яе вершы грунтуюцца на творча пераасэнсаваных памеры і строфіцы пратэстанцкага гімна; выкарыстоўвала нечаканыя інверсіі, сімволіку колераў.

Тв.: Рус. пер. — Стихотворения. М., 1981.

Е.А.Лявонава.

«ДЗІКІЯ», плынь у французскім жывапісе пач. 20 ст. Гл. ў арт. *Фавізм.*

ДЗІКЛАСМТА́, вяршыня ва ўсх. частцы Вял. Каўказа, на мяжы Грузіі, Дагестана і Чэчні. Выш. 4285 м. Складзена з гліністы сланцаў і пясчанікаў. Ёсць ледавікі.

ДЗІКС (Dix) Ота (2.12.1891, Унтэрмгаўз, цяпер у межах г. Гера, Германія — 25.7.1969), нямецкі жывапісец і графік. Вучыўся ў Дрэздэнскай (1919—22) і Дзюсельдорфскай (1922—25) АМ. Праф. Дрэздэнскай АМ (1927—33). У 1920-я г. быў звязаны з *дадаізмам*, *экспрэсіянізмам*. У 1930-я г. шырока выкарыстоўваў сюжэты, сімволіку і прыёмы ням. і нідэрл. жывапісу 15—16 ст., у 2-й пал. 1940-х г. часткова вярнуўся да традыцый экспрэсіянізму. Творам уласцівы востры сац.-крытычны пафас («Акоп», 1920—23; цыкл афортаў «Вайна», 1924; трыпціх «Вайна», 1929—32; фрэска «Вайна і мір», 1960). Аўтар антымілітарысцкіх прац «Сем смяротных грахоў» (1933), «Трыумф смерці» (1934), «Вось чалавек» (1949) і інш. Майстар абвастрана-выразнага партрэта («Партрэт бацькоў», 1921; «Партрэт Марыяны Фогельзанг», 1931).

ДЗІКСАН, скаліста востраў у Енісейскім зал. Карскага м., за 1,5 км ад мацерыка, у Краснаярскім краі Расіі. Пл. каля 25 км^2. Складзены пераважна з дыябазаў. Выш. да 50 м. Палярная станцыя (з 1916), на базе якой у 1930-я г. пабудаваны арктычны радыёметэаралагічны цэнтр і геафіз. абсерваторыя. Рыбазавод. Востраў названы Н.А.Э. Нордэншэльдам у 1878 у гонар швед. купца Дзіксана, які фінансаваў яго экспедыцыю. Порт Дзіксан.

Дзікуша

ДЗІКСЕЛІС Вітаўтас Пранавіч (н. 5.5.1936, г. Варняй, Літва), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1990), праф. (1991). Скончыў Кіеўскае ваен. вучылішча самаходнай артылерыі (1958), Ваен.-паліт. акадэмію (Масква, 1970). З 1970 у Ваен. акадэміі Рэспублікі Беларусь. Даследуе пытанні дыялектыкі развіцця нацый і нац. адносін, метадалагічныя праблемы ваен. тэорыі і практыкі. Аўтар навук. і метадычных дапаможнікаў для слухачоў і ад'юнктаў вышэйшых навуч. ваен. устаноў.

Тв.: Национальные отношения в СССР: диалектика развития на современном этапе. Мн., 1987; Национальные отношения в СССР: закономерности и противоречия развития. Мн., 1990.

У.І.Дзікушын.

О.Дзільс.

ДЗІКУ́ША (Falcipennis falcipennis), птушка сям. цецеруковых атр. курападобных. Пашырана ў горнай тайзе з пераважаем елкі і піхты ў Паўд.-Усх. Сібіры і на Сахаліне. Аселая, трымаецца парамі.

Даўж. 40—43 см, маса 600—750 г. Апярэнне цёмнае, з белымі плямамі на спіне і белым папярочным малюнкам на грудзях, на хвасце белая паласа. Лапы ўкрыты густым апярэннем да асновы пальцаў. Корміцца ігліцай елкі, піхты, лістоўніцы, верхавінкамі моху, ліслем, парасткамі, ягадамі, насякомымі. Гняздо на зямлі. Адкладвае 7—12 яец. У Дз. незвычайныя для дзікай птушкі паводзіны — яна зусім не баіцца чалавека.

ДЗІКУ́ШЫН Уладзімір Іванавіч (8.8.1902, г. Самара, Расія — 12.1.1979), савецкі вучоны ў галіне машынабудавання. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1943). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1928). З 1933 працаваў у Эксперым. НДІ металарэзных станкоў. Гал. інжынер праекта першага аўтаматызаванага з-да паршняў (уведзены ў дзеянне ў 1950). Пад яго кіраўніцтвам распрацавана сістэма агрэгатавання станкоў для апрацоўкі цел вярчэння ў аўтам. лініях. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1951.

ДЗІЛЬС (Diels) Ота Паўль Герман (23.1.1876, г. Гамбург, Германія — 7.3.1954), нямецкі хімік-арганік. Скончыў Берлінскі ун-т (1899), дзе і працаваў (з 1906 праф.). З 1916 у Кільскім ун-це. Навук. працы па структурнай арган. хіміі. Адкрыў важнейшую рэакцыю арган. хіміі — дыенавы сінтэз (1928, разам з К.*Альдэрам*), каталітычную рэакцыю селектыўнага дэгідрыравання з дапамогай селену цыклагексенавага ці цыклагексанавага кольца ў малекулах поліцыклічных злучэнняў (1930). Нобелеўская прэмія 1950 (разам з Альдэрам).

ДЗІЛЬСА—А́ЛЬДЭРА РЭА́КЦЫЯ, гл. *Дыенавы сінтэз.*

ДЗІЛЬТЭЙ (Dilthey) Вільгельм (19.11.1833, Бібрых, цяпер у межах г. Вісбадэн, Германія — 1.10.1911), нямецкі гісторык культуры, філосаф, псіхолаг. Вядучы прадстаўнік філасофіі жыцця, заснавальнік філас. *герменеўтыкі*. Праф. ў гарадах Базель, Кіль, Брэслаў і Берлін. Разглядаў жыццё як культ.-гіст. рэальнасць. У навуках пра «гісторыю духа» лічыў галоўным метад разумення, інтуітыўнага спасціжэння духоўнай цэласнасці асобы і культуры. Паводле Дз., чалавек даведваецца пра тое, што такое ён сам, толькі з гісторыі, якая мае справу з людзьмі як з духоўнымі цэласнасцямі і іх структурамі. Аўтар прац «Уводзіны ў навукі аб духу» (1833), «Ідэя апісальнай і аналітычнай псіхалогіі» (1894), «Узнікненне герменеўтыкі» (1900) і інш.

ДЗІМАЎ Дзімітр (25.6.1909, г. Ловеч, Балгарыя — 1.4.1966), балгарскі пісьменнік і вучоны. Засл. дз. культ. Балгарыі (1963), праф. анатоміі (1953). Дэбютаваў раманам «Паручнік Бенц» (1938). Майстэрствам псіхал. аналізу адметны раман «Асуджаныя душы» (1945), падзеі якога адбываюцца ў Іспаніі напярэдадні і пасля ваенна-фаш. мяцяжу 1936. Сусв. вядомасць прынёс раман «Тытунь» (1951; Дзімітраўская прэмія 1952), прысвечаны жыццю балг. народа ў 1930—40-я г. Аўтар камедыі «Жанчыны з мінулым» (1959), драм «Вінаваты» (1961), «Перадышка ў Арка Ірыс» (1936), а таксама прац па анатоміі.

Літ.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—4. М., 1977—78.

І.С.Александровіч.

ДЗІМІТРАЎГРАД, горад у Расіі, цэнтр раёна ва Ульянаўскай вобл. Вядомы з пач. 18 ст., (да 1972 Мелекес). 132,2 тыс. ж. (1994). Чыг. станцыя. Машынабудаванне і металаапрацоўка (аўтаагрэгаты, хім. машынабудаванне і інш.), дрэваапр., лёгкая (выраб дываноў, ільноперапрацоўка), харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. АЭС. НДІ атамных рэактараў. Драм. т-р. Краязнаўчы музей.

ДЗІМІТРАЎ-МА́ЙСТАРА Уладзімір (1.2.1882, с. Фролаш, Кюстэндзілская акруга, Балгарыя — 29.9.1960), балгарскі жывапісец. Нар. мастак Балгарыі (1952). Вучыўся ў маст. вучылішчы ў Сафіі (1903—10). Аўтар партрэтаў людзей з народа, сцэн сял. жыцця: «Нявеста» (1935), «Сям'я» (1938), «Дзяўчына з с. Шышкаўцы» (1937), «Дзяўчына» (1952) і інш. У яго карцінах з франтальнымі, нібыта распластанымі на плоскасці аллюстраваннямі, абагульненай

манерай жывапісу, кантрастамі яркіх колеравых тонаў набылі маст. гучанне традыцыі балг. нар. мастацтва. Іл. гл. ў арт. *Балгарыя*.

Літ.: Колев Б. В.Димитров-Майстора: Пер. с болг. М., 1961.

ДЗІМІТРО́Ў Георгі Міхайлаў (18.6.1882, с. Кавачэўцы, каля г. Пернік, Балгарыя — 2.7.1949), палітычны і

Г.М.Дзімітроў.

П.Дзірак.

дзярж. дзеяч Балгарыі, дзеяч міжнар. камуніст. руху. Друкар. У 1902—19 у с.-д., адначасова ў прафс. руху (1905—23). Дэп. парламента (1913—23). Адзін з заснавальнікаў і лідэраў Балг. камуніст. партыі (1919), яе ген. сакратар (з 1945). Адзін з арганізатараў *Вераснёўскага паўстання 1923*, пасля яго ліквідацыі ўладамі эмігрыраваў. 9.3.1933 арыштаваны ў Берліне і абвінавачаны герм. нацыстамі ў падпале рэйхстага, на *Лейпцыгскім працэсе 1933* даказаў сваю невінаватасць, яго прамова на працэсе зрабіла значны ўплыў на фарміраванне антыфаш. руху. У 1937—45 у СССР. Ген. сакратар Выканкома *Камуністычнага Інтэрнацыянала* (1935—43), прапагандаваў ідэю *Народнага фронту*. У 1937—45 дэпутат Вярх. Савета СССР. У 1946—49 старшыня СМ Балгарыі.

ДЗІМІТРО́Ў Георгі Петраў (19.4.1904, г. Белаградчык, Балгарыя — 12.3.1979), балгарскі кампазітар, харавы дырыжор. Нар. арт. Балгарыі (1967). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Варшаўскую кансерваторыю (1929). У 1923—39 жыў у эміграцыі (Югаславія, Польшча). У 1940—48 маст. сакратар Сафійскай нар. оперы, у 1946—58 кіраўнік хору імя Г.Кіркава, дзярж. канцэртнага аб'яднання «Музыка». Адзін з ініцыятараў выдання і рэдактар (1952—55) час. «Българска музика» («Балгарская музыка»). З 1949 выкладаў у Балг. кансерваторыі (з 1962 праф.). Аснова яго кампазітарскай творчасці — хар. песні і канцэртныя п'есы. У хар. творах апіраўся на балг. сял. фальклор і рэв. песню. Аўтар муз.-публіцыстычных артыкулаў. Дзімітроўская прэмія 1950.

ДЗІ́НГЕЛЬШТЭТ (Dingelstedt) Франц фон (30.6.1814, Гальсдорф, каля г. Марбург, Германія — 15.5.1881), нямецкі драматург, рэжысёр, тэатр. дзеяч. Праваў у прыдворных т-рах Штутгарта (з 1846), для якога напісаў шматлікія пралогі, п'есу «Дом Берневельт» (1850), Мюнхена (кіраўнік з 1851), дзе ставіў п'есы І.В.Гётэ, Ф.Шылера, Г.Э.Лесінга з удзелам буйнейшых тагачасных акцёраў, Веймара (кіраўнік з 1857), дзе паставіў шэраг п'ес У.Шэкспіра. З 1867 дырэктар опернага т-ра, з 1870 — «Бургтэатра» ў Вене. Дзейнасць Дз. значна паўплывала на развіццё ням. і аўстр. т-ра.

ДЗІ́НТАРЫ, гл. ў арт. *Юрмала*.

ДЗІ́НЦЭНГОФЕР (Dientzenhofer), сям'я архітэктараў, прадстаўнікоў чэшскага і паўд.-ням. барока. У Чэхіі працавалі Крыштаф (7.7.1655, Санкт-Маргарэтэн, каля г. Розенгайм, Германія — 20.6.1722), які ў 1703—11 пабудаваў фасад і неф царквы св. Мікулаша на Мала-Старане ў Празе, і яго сын Кіліян Ігнац (1.9.1689, Прага — 18.12.1751), аўтар шэрагу пластычна выразных пабудоў у Празе (віла «Амерыка», 1715—20; царква св. Мікулаша, 1732—35; палац Кінскіх, 1755—65, і інш.). Да ням. галіны сям'і належаць браты Крыштафа: Георг (11.8.1643, г. Бад-Айблінг, Германія — 2.2.1689) і Іаган Леанард (20.2.1660, Санкт-Маргарэтэн — 26.11.1707), якія працавалі ў Бамбергу; Іаган (25.5.1665, Санкт-Маргарэтэн — 20.7.1726) — аўтар уражыста-ўзвышаных цэркваў (сабор у Фульдзе, 1704—12; манастырская царква ў замку Банц, Баварыя, 1710—18) і палацаў у Померсфельдзэне (1711—18).

К.Дзінцэнгофер, К.І.Дзінцэнгофер і інш. Царква св. Мікулаша на Мала-Старане ў Празе.

«ДЗІПРАСЕЛЬБУ́Д», Дзяржаўнае навукова-даследчае прадпрыемства Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1945 у Мінску з мэтай распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і жыллёва-грамадзянскага буд-ва на вёсцы. Да 1958 наз. «Белсельпраект», з 1958 — «Белдзіпрасельбуд». У 1971 пераўтвораны ў н.-д. і праектны ін-т «БелНДІдзіпрасельбуд». З 1995 сучасная назва. Асн. кірункі дзейнасці: правядзенне навук. даследаванняў і распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі для аб'ектаў сац.-культ. прызначэння, вытв. і невытв. магутнасцей, жыллёвага буд-ва. *Л.А.Дацэнка.*

«ДЗІПРАСУ́ВЯЗЬ», Дзяржаўнае праектнае і навукова-даследчае прадпрыемства Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1968 як Мінскі аддзел комплекснага праектавання ін-та «Дзіпрасувязь» (Масква). З 1970 Мінскае аддзяленне маск. ін-та «Дзіпрасувязь-1», з 1989 ін-т «Дзіпрасувязь-6» Мін-ва сувязі СССР, з 1992 Дзярж. ін-т па вышуканнях і праектаванні збудаванняў сувязі «Дзіпрасувязь». З 1996 сучасная назва. Вядучы н.-д. і праектны ін-т у галіне сувязі, галаўная арг-цыя па метралогіі, стандартызацыі і сертыфікацыі сродкаў сувязі на Беларусі. Асн. кірункі дзейнасці: праектаванне прадпрыемстваў і збудаванняў сувязі, правядзенне н.-д. і доследна-канструктарскіх работ па стварэнні асобных відаў тэхнікі, сувязі, навук. забеспячэнне сістэмы стандартызацыі і сертыфікацыі тэхнікі сувязі, сертыфікацыя абсталявання электрасувязі. *М.М.Анісімаў.*

ДЗІРА́К (Dirac) Поль Адрыен Марыс (8.8.1902, г. Брысталь, Вялікабрытанія — 20.10.1984), англійскі фізік-тэарэтык, адзін са стваральнікаў квантавай механікі і квантавай тэорыі поля. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1930), замежны чл. АН СССР (1931). Скончыў Брыстольскі (1921) і Кембрыджскі (1926) ун-ты. У 1932—69 праф. Кембрыджскага ун-та, з 1971 праф. ун-та штата Фларыда (ЗША). Навук. працы па квантавай механіцы, квантавай электрадынаміцы, квантавай тэорыі поля, тэорыі электрычных часціц і тэорыі гравітацыі. Распрацаваў матэм. апарат квантавай механікі — тэорыю пераўтварэнняў, прапанаваў метад другаснага квантавання (1926—27). Незалежна ад Э.Фермі ў 1926 распрацаваў статыстыку

часціц з паўцэлым спінам (гл. *Фермі—Дзірака статыстыка*), разам з В.Гайзенбергам адкрыў абменнае ўзаемадзеянне (1928). Развіў рэлятывісцкую тэорыю руху электрона (гл. *Дзірака ўраўненне*) і прадказаў існаванне пазітрона (1928). Выказаў гіпотэзы аб існаванні элементарнага магн. зараду (1931) і антырэчыва (1933). Нобелеўская прэмія 1933 (разам з Э.*Шродынгерам*).

Тв.: Рус. пер. — Лекции по квантовой теории поля. М., 1971; Общая теория относительности. М., 1978; Принципы квантовой механики. М., 1979.

Літ.: Поль Дирак и физика XX века: Сб. науч. тр. М., 1990. *М.М.Касцюковіч.*

ДЗІРА́КА МАНАПО́ЛЬ, тое, што *манаполь магнітны*.

ДЗІРА́КА ЎРАЎНЕ́ННЕ, квантава-механічнае рэлятывісцкае хвалевае ўраўненне руху для свабодных элементарных часціц са спінам $^1/_2$. Уведзена П.*Дзіракам* (1928) для апісання 1-й элементарнай часціцы — *электрона*, які падпарадкоўваецца адначасова законам *квантавай механікі* і спец. *адноснасці тэорыі*.

На падставе Дз. ў. прадказана 13-я антычасціца — *пазітрон* і дадзена тэарэт. абгрунтаванне *спіна*. Дз. ў. дало пачатак агульнай тэорыі рэлятывісцкіх хвалевых ураўненняў 1-га парадку ва універсальнай матрычнай форме (гл. *Праектыўных аператараў метад*). Выкарыстоўваецца для апісання лептонаў і кваркаў як першасных крыніц узаемадзеяння элементарных часціц (гл. *Квантавая электрадынаміка*, *Квантавая хромадынаміка*).

Літ.: Федоров Ф.И. Группа Лоренца. М., 1979; Богуш А.А. Введение в калибровочную полевую теорию электрослабых взаимодействий. Мн., 1987. *А.А.Богуш.*

ДЗІ́РАЧНАЯ ЭЛЕКТРАПРАВО́ДНАСЦЬ, праводнасць паўправадніка, у якім асн. носьбітамі зараду з'яўляюцца *дзіркі*. Існуе, калі канцэнтрацыя *акцэптараў* перавышае канцэнтрацыю *донараў*. Наз. таксама праводнасцю р-тыпу. Гл. таксама *Паўправаднікі*.

ДЗІ́РКА ў фізіцы цвёрдага цела, квазічасціца ў паўправадніку, дыэлектрыку ці метале, звязаная з незанятым электронам квантавым станам у валентнай зоне. Пад уздзеяннем знешніх эл. і магн. палёў паводзіць сябе як часціца з дадатным зарадам, роўным па абсалютнай велічыні зараду электрона. Эфектыўная маса Дз. большая, а рухомасць меншая, чым у электрона праводнасці. Дз. разам з электронамі вызначаюць дынамічныя ўласцівасці крышталёў. Гл. таксама *Паўправаднікі*.

ДЗІРЫХЛЕ́ (Dirichlet) Іаган Петэр Густаў (13.2.1805, г. Дзюрэн, Германія — 5.5.1859), нямецкі матэматык. Замежны чл.-кар. Пецярбургскай (1837) і чл. Парыжскай (1854) АН, чл. Берлінскай АН, Лонданскага каралеўскага т-ва (1855). Праф. Берлінскага (1831—55), Гётынгенскага ун-таў (з 1855). Навук. працы па тэорыі лікаў, матэм. аналізе, механіцы, матэм. фізіцы. Даказаў тэарэму пра існаванне бясконца вялікай колькасці простых лікаў у кожнай арыфметычнай прагрэсіі з цэлых лікаў, першы член і рознасць якой — лікі ўзаемна простыя. Сфармуляваў і даследаваў паняцце ўмоўнай збежнасці шэрагу, устанавіў прыкмету збежнасці шэрагу (прыкмета Дз.); даказаў магчымасць раскладання ў шэраг Фур'е функцыі, якая мае канечную колькасць максімумаў і мінімумаў (інтэграл Дз.).

Літ.: Рыбников К.А. История математики. 2 изд. М., 1974.

ДЗІСЕНСКАЯ КЕРА́МІКА, ганчарныя вырабы майстроў з г. Дзісна Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Промысел вядомы са старажытнасці, у 18 ст. дзейнічаў гаршэчна-мулярскі цэх, куды ўваходзілі і ганчары. Тут выраблялі кухонны, сталовы і тарны посуд, які ў залежнасці ад ёмістасці меў розныя назвы: пецяронка (0,5—0,8 л), чацвяронка (1—1,5 л), траёнка (2—3 л), палавінніца (4—5 л), штука (8—10 л). У канцы 19 — 1-й пал. 20 ст. посуд выраблялі тачэннем на ганчарным крузе, глазуравалі празрыстай бясколернай, часам зялёнай ці карычневай палівай, аздаблялі выціснутымі прамымі і хвалістымі паяскамі, падпаліўной ангобнай размалёўкай расл. ха-

Дзісенская кераміка.

рактару. Формы посуду ёмістыя, простых выразных абрысаў. Пашырана была таксама утылітарна-дэкар. кераміка (фігурныя пасудзіны, попельніцы, букетнікі, чарніліцы), дробная пластыка, цацкі. *Я.М.Сахута.*

ДЗІСЕНСКАЯ НІЗІ́НА, частка *Полацкай нізіны* на ПнЗ Віцебскай вобл. Мяжуе на Пн з Браслаўскай, на Пд са Свянцянскімі градамі. Абс. выш. 135—145 м, найб. нізкая адзнака 130 м (нізіна цячэнне р. Дзісна). Складзена з азёрных ледавіковых, пераважна стужачных, пясчана-гліністых адкладаў. Фарміраванне нізіны звязана з утварэннем Дзісенска-Полацкага прыледавіковага вадаёма ў браслаўскую стадыю паазерскага следзянення. Паверхня сучаснай Дз.н. плоска-ўвагнутая, парэзаная далінамі рэк, часта трапляюцца забалочаныя катлавіны з астаткавымі азёрамі. Рачныя даліны слабаўрэзаныя, нявыпрацаваныя, у нізоўях глыбіня ўрэзу да 10 м і больш. У рэльефе вылучаюцца ўчасткі марэнных узвышшаў — былыя астравы Дзісенска-Полацкага вадаёма. Карысныя выкапні: торф, легкаплаўкія гліны. Асн. рака Дзісна з прытокамі Дрысвята, Янка (злева), Бірвета (з Мядзелкай), Галбіца, Бярозаўка, Мнюта, Авута (справа). Азёры: Ельня, Чорнае, Асвята, часткова Богінскае. Сярэдняя т-ра студз. -7 °С, ліп. 17,8 °С, ападкаў 560 мм за год. Пераважаюць дзярнова-падзолістыя слабаглеяватыя, глеяватыя гліністыя і цяжкасугліністыя глебы. На У і З нізіны вял. лясныя масівы з хвоі, драбналістых парод і елкі, трапляецца алешнік. Балоты пераходныя і вярховыя. На тэр. Дз.н. гідралагічны заказнік *Ельня*. *В.П.Якушка.*

ДЗІ́СЕНСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 14—18 ст. Размяшчаўся на в-ве Замак каля сутокаў Дзісны і Зах. Дзвіны ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл. У хроніках Лівонскага ордэна згадваецца каля 1374 і 1377. У 14 — пач. 15 ст. выконваў ролю фарпоста Полацка на Зах. Дзвіне. Пасля Грунвальдскай бітвы 1410 страціў стратэг. значэнне. У час Лівонскай вайны 1558—83 прыйшоў у заняпад, 25.7.1654 быў заняты рус. войскам. Замак хутка быў адноўлены, у 1655 меў 14 вежаў, каля 40 гармат. 10.4.1660 заняты войскам ВКЛ. Знішчаны ў час Паўн. вайны 1700—21.

ДЗІСЕНСКІ ЗВОН, помнік *ліцця мастацкага*. Адліты з бронзы 30.8.1751 ліцейшчыкамі Іванам, Сцяпанам і Максімам Сініцамі для царквы г. Дзісна Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Выш. каля 40 см, найб. дыяметр 30 см. Аздоблены раслінным і хвалістым арнаментам. Дата і фундацыйны надпіс размешчаны ў выглядзе фрызаў, імёны ліцейшчыкаў на тулаве звона. Знаходзіцца ў Дзісенскай царкве. *М.М.Яніцкая.*

ДЗІСЕНСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка на тэр. Беларусі ў 18—20 ст. Утвораны ў крас. 1793 у Мінскай губ., з 1843 у Віленскай губ. Цэнтр — г. *Дзісна*. Пл. 507,8 кв. вёрст, нас. 208,3 тыс. чал. (1897). У 1886 у павет уваходзілі 2125 нас. пунктаў, 22 воласці: Богінская, Варапаншчынская, Верхненская (Вярхнянская), Глыбоцкая, Друйская, За-



Аўтар В.Л.Насевіч

леская, Ігуменская, Іодкаўская (Ёдская), Лужкоўская (Лужэцкая), Луцкая, Лявонпальская, Міёрская (Мёрская), Мікалаеўская, Новапагосцкая, Пастаўская, Перабродская, Пліская, Празароцкая, Стафанпольская, Чарневіцкая, Чарэская, Язненская; заштатны г. *Друя*, 18 мястэчак. З 18.8.1919 да ліп. 1920 Дз. п. у Віцебскай губ. У 1921 у складзе Зах. Беларусі адышоў да Польшчы, уваходзіў у Віленскае ваяв. З 1939 у БССР, са снеж. ў Вілейскай вобл. Скасаваны 15.1.1940.

ДЗІСЕНСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка на Беларусі ў 1940—59. Утвораны 15.1.1940 у Вілейскай вобл. Цэнтр — г. *Дзісна*. 12.10.1940 падзелены на 12 сельсаветаў. Пл. 800 км^2, 1 горад і 560 сельскіх нас. пунктаў (1947). З 20.9.1944 у Полацкай, з 8.1.1954 у Маладзечанскай абласцях. Скасаваны 3.10.1959, тэр. перададзена ў Міёрскі і Пліскі р-ны.

ДЗІСЕНСКІ УВАСКРАСЁНСКІ МАНАСТЫ́Р. Дзейнічаў у 1633—1810 у г. Дзісна (цяпер Міёрскі р-н Віцебскай вобл.). Засн. пры Уваскрасенскай царкве, вядомай з 1568. Прыналежнасць манастыра да праваслаўя пацвярджана каралеўскімі прывілеямі Уладзіслава IV, Яна Казіміра (1661), Яна III Сабескага (1678), Аўгуста II, Аўгуста III (1736). Існаваў на ахвяраванні мяшчан, у 17 ст. меў невял. маёнтак Горкі. Пры царкве былі тры брацтвы. У 1770 у час пажару Дзісны Уваскрасенская царква згарэла, у 1730-я г. пабудавана новая. У 1810 манастыр зачынены, царква стала прыходскай (згарэла ў 1882). Брацкі крыж 1673, які раней знаходзіўся ў манастыры, украдзены з Адзігітрыеўскай царквы (Дзісна) у 1980-я г. *А.А.Ярашэвіч.*

ДЗІСНА́, рака ў Віцебскай вобл. і Літве, левы прыток Зах. Дзвіны. Даўж. 178 км, у межах Беларусі каля 149 км. Пл. вадазбору 8180 км^2, у межах Беларусі каля 7730 км^2. Выцякае з воз. Дзіснай (Літва), цячэ па тэр. Браслаўскага (на мяжы з Літвой), Пастаўскага, Шаркаўшчынскага і Міёрскага р-наў па Дзісненскай нізіне — зах. ч. Полацкай нізіны. У верхнім цячэнні называецца Дзісенка. Асн. прытокі: Бірвета, Галбіца, Бярозаўка, Мнюта, Авута (справа), Дрысвята, Янка, Маціца (злева).

Рака Дзісна ў ніжнім цячэнні.

Даліна трапецападобная, шыр. 400—600 м, месцамі да 1,5 км. Рэчышча звілістае, на працягу 7,7 км каналізаванае, шыр. ад 20—30 м да 100 м у нізоўях. Берагі ў вярхоўях нізкія, часткова забалочаныя, на астатнім працягу стромкія, выш. 2—7 м, у месцах выхаду грунтавых вод забалочаныя. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 52,4 м^3/с. Рака замярзае ў 2-й дэкадзе снеж., крыгалом у 1-й дэкадзе сакавіка.

ДЗІСНА́, горад у Міёрскім р-не Віцебскай вобл., на р. Дзісна, пры ўпадзенні яе ў Зах. Дзвіну. За 45 км ад г. Міёры, 12 км ад чыг. ст. Боркавічы на лініі Полацк—Даўгаўпілс (Латвія). Аўтадарогамі злучана з Полацкам, Глыбокім, Міёрамі. 2,7 тыс. ж. (1995).

У 10—11 ст. полацкія крывічы заснавалі тут невял. крэпасць — Капец-гарадок, тэр. вакол яго заселена да 13 ст. З 1301 Дз. ў ВКЛ. З 14 ст. згадваецца *Дзісенскі замак*. З 1563 сяло. У 1567 атрымала герб, у 1569 новы герб (у блакітным полі ладдзя з разгорнутым ветразем) і стала горадам. У 16—17 ст. пабудаваны правасл. Уваскрасенская (гл. *Дзісенскі Уваскрасенскі манастыр*), Узвіжанская, Спаса-Праабражэнская і уніяцкая Міхайлаўская цэрквы, парафіяльны касцёл, францысканскі кляштар. У 17 ст. цэнтр староства. Вял. страты нанесены Дз. ў часы Лівонскай вайны 1558—89, вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 і Паўн. вайны 1700—21, пажараў і эпідэмій. З 1793 у Рас. імперыі, з 1795 цэнтр *Дзісенскага павета* Мінскай, з 1842 Віленскай губ. У 1897 у Дз. 6,7 тыс. ж. З 1922 у Дзісенскім пав. Віленскага ваяв. Польшчы. 6073 ж. (1939). З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр *Дзісенскага раёна*. У Вял. Айч. вайну з 5.7.1941 да 4.7.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія ў горадзе і раёне загубілі 4584 чал., у горадзе стварылі лагер смерці. З 1959 Дз. ў Міёрскім р-не. 2,5 тыс. ж. (1959).

Прадпрыемствы буд. матэрыялаў, харч. прам-сці. Помнік архітэктуры — царква Адзігітрыі (19 ст.). Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магілы ахвяр фашызму. Помнік Вызвалення.

ДЗІ́ТВА, рака на тэр. Літвы і Воранаўскага і Лідскага р-наў Гродзенскай вобл., правы прыток р. Нёман. Даўж. 93 км (у межах Беларусі каля 90 км). Пл. вадазбору 1220 км^2. Пачынаецца каля г. Эйшышкес у Літве, цячэ ў межах Лідскай раўніны, у нізоўі — па Нёманскай нізіне. Асн. прытокі: Каменка, Восава, Няшкрупа, Крупка, Лідзея (злева), Радунька, Чарняўка (справа). Даліна выразная, яе шыр. да ўпадзення р. Крупка 1—2,5 км, ніжэй 600 м — 1,1 км. Рэчышча ад мяжы з Літвой на працягу 50 км каналізаванае, ніжэй моцназвілістае, падзяляецца на рукавы. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 8,2 м^3/с.

ДЗІ́ТВА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., каля аўтадарогі Гродна—Ліда. Цэнтр сельсавета. За 12 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Ліда, 102 км ад Гродна. 1859 ж., 562 двары (1997). Торфабрыкетны з-д, птушкафабрыка, буд. мантажнае ўпраўленне № 2. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ДЗІТВЯ́НСКАЕ БАЛО́ТА, Дзітва, у Воранаўскім і Лідскім р-нах Гродзенскай вобл., у пойме р. Дзітва і яе прытока р. Радунька. Нізіннага тыпу. Пл. 5,2 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 4,3 тыс. га. Глыб. торфу да 6 м, сярэдняя 2,3 м. Паўн. ч. балота, у т.л. поўма р. Радунька, асушана, занята пасевамі шматгадовых траў. На неасушаных участках хмызняк, асокі. На Пд балота пясчаныя грады, праслоі хмызняком.

ДЗІ́ТРЫХ (Dietrich) Марлен [сапр. Лош (Losh) Марыя Магдалена фон; 27.12.1904, Берлін — 5.5.1992], амерыканская кінаактрыса. Вучылася ў Муз. акадэміі і Школе драм. мастацтва М.*Райнгарта* (Берлін). У 1922 дэбютавала ў т-ры, у 1923 — у кіно. У 1930 сыграла першую значную ролю ў фільме «Блакітны анёл» (паводле рамана Т.Мана). З 1930 у Галівудзе, ЗША. Здымалася ў экзатычных фільмах рэж. Дж. Штэрнберга «Шанхайскі экспрэс», «Чырвоная імператрыца», «Д'ябал — гэта жанчына» ў амплуа жанчыны-«вамп», была адной з самых папулярных «зорак» амер. кіно 1930-х г. У 2-ю сусв. вайну вяла антыфаш. прапаганду. У 1950-я г. стварыла яркія складаныя характары ў фільмах «Сведка абвінавачання», «Працэс у Нюрнбергу» і інш. Вядома і як эстр. спявачка.

ДЗІЎ́Ф (Diouf) Абду (н. 7.9.1935, г. Луга, Сенегал), сенегальскі паліт. і дзярж. дзеяч. Скончыў Дакарскі і Парыжскі ун-ты. Чл. Сацыяліст. партыі Сенегала, з 1981 яе ген. сакратар. У 1960-я г. дырэктар кабінета прэзідэнта Сенегала, ген. сакратар урада, міністр планавання і прам-сці. У 1970—81 і 1983—91 прэм'ер-міністр. З 1981 прэзідэнт Сенегала, адначасова ў 1982—89 прэзідэнт Канфедэрацыі Сенегамбіі. У 1985—86 старшыня Арг-цыі афр. адзінства.

ДЗІЎ́НАСЦЬ, адзін з *квантавых лікаў*, які характарызуе *адроны*. Абазначаецца S, прымае цэлалікавыя (нулявыя, дадатныя або адмоўныя) значэнні, прычым $|S| \leq 3$. Антычасціцы маюць Дз. процілеглага знака ў параўнанні з Дз. часціц. Адроны з $S \neq 0$ (К-мезоны, гіпероны і многія рэзанансы) наз. дзіўнымі. Дз. захоўваецца ў моцных і эл.-магн. узаемадзеяннях, аднак парушаецца (на 1) у слабым узаемадзеянні. Гл. таксама *Прыгажосць*, *Чароўнасць*.

ДЗІЎ́НАЎСКІ МУЗЕ́Й МАСТА́ЦТВА І ЭТНАГРА́ФІІ. Адкрыты ў 1982 у в. Дзіўная Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл. Размяшчаецца ў будынку б. лютэранскага храма 19 ст. Экспазіцыя складаецца з 2 аддзелаў: этнаграфічнага, у якім экспануюцца прадметы старажытнай матэрыяльнай культуры беларусаў, вырабы нар. ганчарства, кавальства, пляцення з лазы і саломкі, ткацтва, і мастацкага, дзе прадстаўлены жывапісныя і графічныя творы бел. мастакоў Я.Драздовіча, П.Сергіевіча, В.Цвіркі, Л.Шчамялёва, У. і М.Басалыгаў, П.Драчова, Я.Куліка, А.Марачкіна, В.Маркаўца, А.Кашкурэвіча, А.Паслядовіч, У.Тоўсціка, М.Купавы, У.Сулкоўскага, У.Савіча і інш. Працуе на грамадскіх пачатках. *М.М.Купава.*

«ДЗІЎНАЯ ВАЙНА́», «сядзячая вайна», пашыраная ў гіст. л-ры назва пач. перыяду (вер. 1939 — май 1940) *другой сусветнай вайны 1939—45* на фронце ў Зах. Еўропе. Характарызавалася адсутнасцю актыўных баявых дзеянняў паміж англа-франц. і сканцэнтраванымі супраць іх герм. войскамі. Скончылася ў сувязі з наступленнем ням.-фаш. армій у Зах. Еўропе.

Літ.: Мэйсон Д. «Странная война»: Пер. с англ. // От Мюнхена до Токийского залива: Взгляд с Запада на трагич. страницы истории второй мировой войны: Перевод. М., 1992.

ДЗІЦЯ́ЧАЕ КІНО́, мастацкія (ігравыя), хранікальна-дакументальныя, навукова-пазнавальныя, мультыплікацыйныя (анімацыйныя) фільмы для дзяцей і юнацтва. Выхаваўчыя задачы, якія ставяцца перад Дз.к., вызначаюць яго тэматыку і жанравыя асаблівасці. Як асобны кірунак у сав. кінематографе вылучылася ў 1920-я г. Асаблівасці выразна праявіліся ў фільмах «Чырвоныя чарцяняты» (1921, рэж. І.Перысціяні), «Пуцёўка ў жыццё» (1931, рэж. М.Экк), «Падраныя чаравікі» (1933, рэж. М.Барская) і інш. У 1936 у Маскве створана кінастудыя «Саюздзетфільм», рэарганізаваная ў 1948 у Цэнтр. студыю дзіцячых і юнацкіх фільмаў імя М.Горкага. Дзіцячыя фільмы выпускаліся і на рэсп. кінастудыях. У 1992 створаны Міжнар. фонд развіцця кіно і тэлебачання для дзяцей і юнацтва («Фонд Раланда Быкава», Масква).

У бел. кінематографе першая маст. карціна для дзяцей — «Грышка-свінапас» (1928, рэж.-мантажор В.Кубліцкі), зманціраваная з маст. фільма «Лясная быль» (1926, рэж. Ю.Тарыч). У 1930-я г. створаны фільмы пра піянераў («Кульгаўка», 1931, рэж. Ю.Вінакураў; «Баям насустрач», 1932, рэж. Э.Аршанскі; «Адбітак часу», 1932, рэж. Г.Кроль), пра юных следапытаў («Палескія рабінзоны», 1934, рэж. І.Бахар, П.Малчанаў), рабфакаўцаў («Песня вясны», 1935, рэж. У.Гардзін), юных талентаў («Канцэрт Бетховена», 1936, рэж. М.Гаўронскі, У.Шмітгоф). Больш плённа Дз.к. на Беларусі развівалася ў пасляваен. час: сюжэты кінахронікі, дакумент. кінанавелы, маст. фільмы рознай тэматыкі (гіст.-рэв., гераіка-патрыят., прыгодніцкія, казачныя). Яны вызначаліся гуманнасцю, актыўнасцю юных герояў, што ярка выявілася ў фільмах рэж. Л.*Голуба*: «Міколка-паравоз» (1957), «Дзяўчынка шукае бацьку» (1959), «Вуліца малодшага сына» (1962), «Пушчык едзе ў Прагу» (сумесна з ЧССР, 1966), «Анюціна дарога» (1968), «Паланэз Агінскага» (1971), «Маленькі сяржант» (1975). Фільмы пра пакаленне дзяцей, якое зведала вайну, ставілі рэжысёры В.*Тураў* («Праз могілкі», 1964, «Я родам з дзяцінства», 1966), І.*Дабралюбаў* («Іван Макаравіч», 1970, «Расклад на паслязаўтра», 1978, «Мама, я жывы», 1985), В.*Нікіфараў* («Зімародак», 1972, «Ціхія троечнікі», 1980; «Вялікая прыгода», 1985), В.*Рубінчык* («Апошняе лета дзяцінства», 1972, «Вянок санетаў», 1977). Фільмы прыгодніцкія, казачныя вызначылі творчасць рэжысёраў Л.*Мартынюка* («Пяцёрка адважных», 1971, «Сямейныя акалічнасці», 1977, «Ветразі майго дзяцінства», 1981, «Белае возера», 1992), Л.Нячаева («Прыгоды Бураціна», 1976, «Пра чырвоную шапачку», 1977, «Рыжы, сумленны, закаханы», 1984, «Казка пра зорнага хлопчыка», 1985, «Пітэр Пэн», 1987), У.*Бычкова* («Горад магістраў», 1966, «Восеньскі падарунак фей», 1984). У 1990-я г. вытворчасць дзіцячых фільмаў скарацілася. Выпушчаны: «Мёд асы» (1992, рэж. І.Волчак), «Зязюліны дзеці» (1992, рэж. А.Мароз), «Вогненны стралок» (1993, рэж. М.Князеў), «Я — Іван, ты — Абрам» (1993, рэж. І.Зоберман), «Кветкі правінцыі» (1995, рэж. Дз.Зайцаў), «Шэльма» (1996, рэж. А.Ганчаронак, І.Чацверыкоў), «Батанічны сад» (1997, рэж. В.Гасцюхін) і інш. Значнае месца ў дзіцячым кінематографе займаюць дакумент., а з пач. 1970-х г. мультыплікацыйныя і лялечныя фільмы (гл. *Анімацыйнае кіно*, *Дакументальнае кіно*).

Е.Л.Бондарава.

ДЗІЦЯ́ЧА-ЮНА́ЦКІЯ СПАРТЫЎНЫЯ ШКО́ЛЫ, гл. ў арт. *Спартыўныя школы*.

ДЗІЦЯ́ЧАЯ ЛІТАРАТУ́РА, творы маст. л-ры для дзяцей і юнацтва. У шырокім сэнсе ўключае і многія «дарослыя» творы сусв. класікі, якія ўвайшлі ў кола

Да арт. **Дзіцячае кіно**. Кадр з мультыплікацыйнага фільма «Дзед і Жораў».

Да арт. **Дзіцячае кіно**. Кадр з мультыплікацыйнага фільма «Песня пра зубра».

Да арт. **Дзіцячае кіно**. Кадр з фільма «Маленькі сяржант».

Да арт. **Дзіцячае кіно**. Кадр з фільма «Дзяўчынка шукае бацьку».

Да арт. **Дзіцячае кіно**. Кадр з фільма «Мароз-ка».

Да арт. **Дзіцячае кіно**. Кадр з фільма «Горад майстроў».

дзіцячага чытання («Рабінзон Круза» Д.Дэфо, «Падарожжа Гулівера» Дж.Свіфта, «Спартак» Р.Джаваньёлі, «Хаціна дзядзькі Тома» Г.Бічэр-Стоу, раманы Ж.Верна, «Авадзень» Э.Л.Войніч і інш.), а таксама казкі (Ш.Перо, братоў Я. і В.Грым, Х.К.Андэрсена, А.Пушкіна і інш.), творы нар. эпасу («Слова пра паход Ігаравы», «Сасунцы Давід» і інш.). Папулярнасцю сярод дзяцей карыстаюцца раманы Дж.Ф.Купера, творы К.Чукоўскага, «Курган», «Бандароўна» Я.Купалы, «Новая зямля» і «Сымон-музыка» Я.Коласа і інш.

Першымі кнігамі для дзіцячага чытання былі азбукі, буквары, што паявіліся ў Еўропе ў 15—16 ст. Першай спец. дзіцячай кнігаю лічыцца «Свет пачуццёвых рэчаў у малонках» чэш. педагога Яна Амоса Каменскага (1658). У Расіі Дз.л. ўзнікла ў 18 ст. Найб. значныя творы 19 — пач. 20 ст. — байкі І.Крылова, «Канёк-Гарбунок» П.Яршова, многія творы М.Лермантава, М.Някрасава, М.Гогаля, У.Караленкі, А.Чэхава, Л.Талстога і інш. Папулярныя творы для дзяцей італьян. пісьменніка Дж.Радары, польск. педагога Я.Корчака і інш.

Зараджэнне бел. Дз.л. звязана з узнікненнем кнігадрукавання, вучэбнай кнігі, дзейнасцю Ф.Скарыны, С.Буднага, Л. і С.Зізаніяў, Л. і К.Мамонічаў, Сімяона Полацкага і інш. У 19 ст. творы для дзяцей пісалі Ф.Багушэвіч, А.Гурыновіч, Я.Лучына. Яны заклалі асновы гуманіст. Дз.л., звязанай з традыцыямі фальклору. Гэтымі якасцямі вызначаліся «Беларускі лемантар» (1906), «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі (1906), «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я.Коласа (1909), п'есаказка К.Лейкі «Снатворны мак» (1912). Творы для дзяцей друкаваў час. *«Лучынка»*. У скарбніцу Дз. л. ўвайшлі многія творы М.Багдановіча, З.Бядулі і інш. Сістэматычна кнігі і перыёдыка для дзяцей выдаюцца з 1920-х г. Жанр літ. казкі развівалі У.Дубоўка, С.Шушкевіч, А.Якімовіч, вершы і песні для дзяцей пісалі Купала, Дубоўка, П.Трус, А.Гурло, Я.Журба і інш., апавяданні — Колас, Якімовіч, Л.Чарняўская. Заснавальнік бел. навук.-фантаст. і прыгодніцкай аповесці — Я.Маўр. У 1930-я г. тэматыка Дз.л. пашырылася, з'явіліся займальныя творы па гісторыі, прыродзе, маральна-этычных праблемах («Палескія рабінзоны», «ТВТ» Маўра, «Міколка-паравоз» М.Лынькова, «Насцечка» К.Чорнага, паэма «Міхасёвы прыгоды» Коласа). Традыцыі фальклору выкарыстаны ў вершаванай казцы Якімовіча «Каваль-Вярнідуб», аповесці Бядулі «Сярэбраная табакерка», п'есах-казках В.Вольскага. У Айч. вайну Дз.л. ўзбагачалася за кошт твораў для дарослых (Чорны, Лынькоў, паэма А.Астрэйкі «Прыгоды дзеда Міхеда», вершы М.Танка, А.Куляшова, П.Броўкі, П.Панчанкі і інш.). Падзеі вайны адлюстраваны ў кн. пісьмаў-успамінаў дзяцей, што зведалі жахі фашызму, — «Ніколі не забудзем» (1948, 4-е выд. 1981). Лёс дзяцей вайны паказаны ў апавяданнях Я.Брыля, Маўра, Якімовіча і інш., у паэмах А.Бялевіча, Э.Агняцвет і інш., у аповесцях П.Кавалёва «Андрэйка» (1948), Г.Васілеўскай «Маланка ўначы» (1963), Г.Бураўкіна «Тры старонкі з легенды» (1968), у творах А.Пальчэўскага, Х.Жычкі, Я.Курто, Л.Прокшы, Д.Слаўковіча, І.Сяркова і інш. Свет дзяцінства і юнацтва даследуецца ў тэтралогіі А.Васілевіч «Пачакай, затрымайся...» (1966—70), у аповесцях І.Навуменкі («Вайна каля Цітавай копанкі», 1957), А.Рылько («Мядовыя краскі», 1959), П.Кавалёва («Лёнька Гром», 1961), Г.Шыловіча («Чарапаха без панцыра», 1966), Я.Бяганскай («Кожны марыць стаць Калумбам», 1968), М.Зарэмбы («Дзень магнітнай буры», 1992) і інш. Развіваецца краязнаўчая, навук.-пазнавальная проза (кн. нарысаў В.Вольскага, У.Караткевіча, Я.Пархуты, А.Клышкі, У.Арлова і інш.), аповесць біяграфічная (З.Бандарына, С.Александровіч, Л.Арабей, В.Хомчанка, А.Лойка), прыгодніцкая (У.Краўчанка, М.Ваданосаў, А.Шашкоў, А.Чарнышэвіч і інш.), фантастычная (П.Місько «Эрпіды на планеце Зямля», 1987, творы М.Гамолкі, Р.Баравіковай, У.Шыціка, Аляксея Якімовіча і інш.). Проза для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту прадстаўлена лірычным апавяданнем, казачнай аповесцю, псіхал. навелай, займальнымі дыялогамі («Ліпка і клёнік» Брыля, «Такіх кветак не бывае» В.Гарбука, «Дыялогі з унучкамі» Віткі; творы І.Грамовіча, Кавалёва, П.Рунца, Хомчанкі, У.Юрэвіча і інш.). У нар. традыцыі напісаны казкі Васілевіч, А.Кобец-Філімонавай, К.Каліны, Міська, У.Ягоўдзіка і інш. Гумарам, адчуваннем спецыфікі ўзросту вылучаецца паэзія для дзяцей (казкі Віткі «Вавёрчына гора», «Буслінае лета», зб-кі «Дударык», «Чытанка-маляванка»; Танка «Ехаў казачнік Бай»; Шушкевіча «Лясная калыханка»; Дубоўкі «Кветкі — сонцавы дзеткі»; Н.Гілевіча «Загадкі»; Е.Лось «Смачныя літары»; творы Лойкі, Р.Барадуліна, Д.Бічэль-Загнетавай, Н.Галіноўскай, У.Карызны, Т.Кляшторнай, М.Маляўкі, П.Сушко, М.Пазнякова і інш.). Пра хараство роднай прыроды паэмы-казкі М.Калачынскага «Прыгоды Патапкі», М.Лужаніна «Хто робіць пагоду», Лойкі «Як Тоня рэха шукала», творы А.Дзеружынскага, І.Муравейкі, С.Грахоўскага, П.Пранузы, В.Лукшы, Ягоўдзіка і інш. Традыцыйна казачнае спалучана з сучасным у А.Вольскага («Што такое мікра тое»), Танка («Быліна пра касмічнае падарожжа мураша Бадзіні»), А.Грачанікава («Валерка і лятаючая талерка») і інш. Шмат дасціпных гумарыст. твораў напісалі для дзяцей Барадулін, Агняцвет, М.Чарняўскі і інш. Дз.л. далучае дзяцей да агульначалавечых каштоўнасцей, паглыбляе сувязі з нац. каранямі (зб-кі «Добры чалавек» Гілевіча, «Хата, поўная гасцей» В.Зуёнка, «Гуканне вясны» В.Жуковіча, «Як Бог стварыў свет» У.Ліпскага, «Пра ўсе справы Дзіва-Дзяржавы» Лойкі, «Гараднічанка» Бічэль-Загнетавай, «Азбука — вясёлы вулей» Барадуліна і інш.). У жанры драматургіі для дзяцей працаваў П.Макаль, працуюць А.Вольскі, А.Вярцінскі, А.Махнач, Ягоўдзік і інш.

Літ.: Гурэвіч Э.С. Беларуская дзіцячая літаратура (1917—1967). Мн., 1970; Дзіцячая літаратура БССР: (Рэкаменд. паказ. літ. 1945—1960 гг.). Мн., 1961; Дзіцячая літаратура БССР: Рэкаменд. паказ. літ., 1961—1965. Мн., 1967. *М.Б.Яфімава.*

ДЗІЦЯ́ЧАЯ МУ́ЗЫКА, музыка, адрасаваная дзіцячай аўдыторыі або прызначаная для выканання дзецьмі. Дз. м. ўласцівы вобразная дакладнасць, канкрэтнасць, інстр. творам — праграмнасць. Яе тэмы часцей за ўсё звязаны з казачнасцю, сюжэтамі ці сцэнкамі з дзіцячага жыцця, замалёўкамі роднай прыроды. Сярод чыста муз. асаблівасцей твораў для дзяцей — абагульненне праз бытавыя жанры, выкарыстанне выяўл. прыёмаў, выразнасць і прастата формы, меладычнасць, нац. акрэсленасць муз. мовы. У Дз. м. прадстаўлены амаль усе муз. жанры, аднак, улічваючы выканальніцкія магчымасці дзяцей, кампазітары адмаўляюцца ад складаных прыёмаў інстр. і вак. тэхнікі.

Узоры Дз.м. былі вядомы ўжо ў Стараж. Грэцыі (песенькі, творы для навучання ігры на аўласе і інш.). У розных народаў свету існуе дзіцячы фальклор. Уклад у развіццё Дз.м. зрабілі многія кампазітары-класікі, у т.л. І.С.Бах, І.Гайдн («Дзіцячая сімфонія»), Р.Шуман («Альбом для юнацтва» для фп.), П.Чайкоўскі («Дзіцячы альбом» для фп.), а таксама зах.-еўрап. кампазітары 20 ст. [«Мікракосмас» Б.Бартака (6 сшыткаў фп. п'ес, у якіх юныя музыканты далучаюцца да сучасных сродкаў выразнасці), песні і хары З.Кодая, прызначаныя для рэалізацыі яго метаду муз. выхавання, «Музыка для дзяцей» у 5 тамах К.Орфа, што дае аснову для калектыўнага музіцыравання дзяцей, оперы «Мы будуем горад» П.Хіндэміта, «Маленькі трубачыст» і «Ноеў каўчэг» Б.Брытэна, дзе шэраг роляў выконваюць дзеці]. Класікамі Дз.м. сталі С.Пракоф'еў (фп. цыкл «Дзіцячая музыка», сімф. казка «Пеця і воўк», вак.-сімф. сюіта «Зімовы касцёр») і Дз.Кабалеўскі (дзіцячыя лірычныя песні, 3 сшыткі фп. п'ес, кантата «Песні ранку, вясны і міру», трыяда юнацкіх канцэртаў); шырока вядомы песні Ю.Чычкова, У.Шаінскага, музыка да дзіцячых кінафільмаў Я.Крылатава і інш.

Дзіцячы фальклор беларусаў побач з размоўнымі жанрамі, ўключае, калыханкі і песенькі для дзяцей старэйшага ўзросту. Нар. песні змешчаны ў найб. ранніх нац. зб-ках «Школьны спеўнік» (1920) і «Беларускі дзіцячы спеўнік» (1925) А.Грыневіча. Інтэнсіўна і разнастайна працуюць у галіне Дз.м. бел. кампазітары. Ствараецца нац. рэпертуар для муз. т-ра. Сярод муз.-сцэн. твораў для дзяцей першая дзіцячая опера «Марынка» Р.Пукста (паст. 1955), першая муз. камедыя «Сціпан — вялікі пан» Ю.Семянякі (паст. 1979), шырока вядомы балет «Маленькі прынц» Я.Глебава (паст. 1982). З канца 1980-х г. на Беларусі ўзнікаюць тэатр. калектывы з дзіцячымі трупамі, якія значна стымулююць паяўленне дзіцячых муз.-сцэн. твораў; сярод іх: мюзікл «Пітэр Пэн» А.Будзько (паст. 1990; Дзіцячы муз. т-р-студыя пры Нац. т-ры оперы), опе-

ра «Вясновая песня» і мюзікл «Прыгоды ў замку Алфавіт» В.Войціка (паст. 1993 і 1996, Дзіцячы муз. т-р-студыя «Казка» пры Дзярж. т-ры муз. камедыі), опера «Мілавіца» У.Солтана (1991). Пачынаючы з оперы «Рукавічка» М.Чуркіна (1941, паст. 1948), развіваецца жанр радыёоперы для дзяцей («Рак-вусач» Дз.Лукаса паводле казкі Я.Коласа, 1941, паст. 1960; «Тараканішча» Л.Шлег паводле К.Чукоўскага, паст. 1973; опера «32 волаты» Н.Усцінавай 1983, Віцебская абл. студыя тэлебачання). Значнае месца адводзіцца музыцы для дзяцей у спектаклях драм. т-раў. З Бел. рэсп. т-рам юнага гледача актыўна супрацоўнічалі Я.Глебаў, Э.Зарыцкі, Дзярж. т-рам лялек Беларусі — А.Залётнеў, І.Кузняцоў, В.Помазаў, К.Цесакоў, з Брэсцкім абл. т-рам лялек — М.Русін. Муз. афармленню дзіцячых тэле- і радыёперадач, мультфільмаў вял. ўвагу аддавалі Л.Абеліёвіч, Г.Вагнер, Глебаў, Зарыцкі, Л.Захлеўны, У.Кандрусевіч, С.Картэс, А.Мдывані, Семяняка. У жанры вак.-сімф. і харавой музыкі найб. значныя араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства» Глебава і «Бай прыдумаў» Картэса, кантаты «Песня згоды» Помазава і «Упарты Фама» Р.Суруса, сюіта «Званы» М.Васючкова і харавыя гульні «Ладачкі» В.Кузняцова. Дасціпнасцю муз. вырашэння адметныя вак. цыклы «Вясёлыя дзіцячыя песні» Картэса, «Пра дзяцей» П.Падкавырава, «Містэр Кваклі і іншыя» Э.Тырманд, разлічаныя на дарослых выканаўцаў. Багата пададзена ў бел. музыцы дзіцячая хар. песня. Далучэнню дзяцей да бел. фальклору спрыяюць хар. апрацоўкі бел. нар. песень Семянякі, Цесакова, Цікоцкага, папулярныя ў дзяцей кампазіцыі У.Дамарацкага, Ш.Ісхакбаевай, В.Сярых. Камерна-інстр. жанр Дз.м. прадстаўлены цыкламі праграмных мініяцюр тыпу «Дзіцячых альбомаў», «Школьных сшыткаў» для розных інстр. складаў. У рэпертуар бел. школьнікаў трывала ўвайшлі п'есы Абеліёвіча, А.Багатырова, Вагнера, Г.Гарэлавай, Ісхакбаевай, В.Карэтнікава, Л.Мурашкі, Падкавырава, Суруса, Тырманд, Усцінавай, Цесакова і інш. Асобная галіна інструктыўнай музыкі — творы, звязаныя з фалькл. элементам у спалучэнні з сучаснымі сродкамі выразнасці, у т.л. сшытак эцюдаў-карцін для цымбалаў Войціка, «Карагоды» для фп. трыо, «25 беларускіх песень і танцаў» для скрыпкі і фп., «П'есы з эпіграмамі» для балалайкі і фп., «7 п'ес у ладах» для цымбалаў і фп. Гарэлавай, «поліфанічны сшытак» для фп., «Беларускія сшыткі школьніка» для баяна і домры, сюіта-казка «Кацігарошынка» для домры і фп., цыклы «Лубочак» для трубы і фп., «Дударачка» для кларнета і фп. Шлег. Развіццё Дз.м. стымулюецца павышэннем тэхн. ўзроўню выканальніцтва і агульнай муз. культуры дзяцей, што звязана з удасканаленнем сістэмы муз. адукацыі і муз. выхавання.

Літ.: Асафьев Б. Русская музыка о детях и для детей // Сов. музыка. 1948. № 6; Сосновская О. Советские композиторы детям. М., 1970; Степанцевич К., Глущенко Г. Школьникам о музыке. Мн., 1962.

Р.М.Аладава.

ДЗІЦЯ́ЧАЯ ПРА́ЦА, 1) праца малалетніх асоб, якія не дасягнулі ўзросту працоўнай дзеяздольнасці. У 1833 у Вялікабрытаніі прыняты закон, паводле якога забаранялася эксплуатацыя Дз.п. і была ўстаноўлена працягласць прац. дня для дзяцей 9—13 гадоў 8, для падлеткаў да 18 гадоў — 12 гадзін. У Францыі першым актам, які рэгуляваў Дз.п., быў закон 1841. У ЗША федэральным законам 1938 аб прац. нормах быў устаноўлены мінім. ўзрост прыёму на працу — 16 гадоў. У пач. 1970-х г. у краінах, якія сталі на шлях развіцця, працоўныя ва ўзросце 10—14 гадоў складалі, паводле даных ЮНЕСКА, 31% агульнай колькасці дзяцей гэтага ўзросту. Паводле звестак Цэнтра ААН па правах чалавека ў Жэневе (1993) больш за 100 млн. дзяцей у свеце існуюць за кошт цяжкай працы, больш за 50 млн. дзяцей працуюць у небяспечных або шкодных для здароўя ўмовах. Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 13.12.1956 забаронены прыём на работу асоб, якім не споўнілася 16 гадоў. У Беларусі ў 1993 прыняты Закон «Аб правах дзіцяці», паводле якога самаст. праца непаўналетніх дапускаецца з 16-гадовага ўзросту; забараняецца прымус дзіцяці да любой працы, небяспечнай для яго здароўя або якая перашкаджае атрыманню *базавай адукацыі*. 2) Від працоўнай дзейнасці, якая выкарыстоўваецца ў выхаваўчых мэтах з раннягa дзяцінства. У класічнай пед. л-ры (Я.А.Каменскі, Дж.Лок, І.Г.Песталоцы, К.Дз.Ушынскі, П.П.Блонскі, С.Ф.Шацкі, А.С.Макаранка, В.А.Сухамлінскі) і сучасных даследаваннях (Р.С.Бурэ, Г.М.Годзіна, В.І.Логінава, В.Г.Нячаева, Д.В.Сяргеева, А.Д.Шатава і інш.) адзначаецца выхаваўчы характар працы, яна разглядаецца як натур. ўмова жыццядзейнасці і першая жыццёвая неабходнасць здаровага арганізма. У выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту выкарыстоўваецца праца па самаабслугоўванню, што развівае самастойнасць, вучыць пераадольваць цяжкасці, прывучае да ахайнасці і чысціні. Гаспадарча-бытавая праца мае грамадскую накіраванасць — задавальненне патрэбнасцей інш. дзяцей або дарослых. Праца дзяцей у прыродзе (догляд за раслінамі і жывёламі) накіравана на задавальненне патрэбнасцей дзяцей па ахове прыроды. У далейшым такая праца становіцца адным з відаў прадукц. працы. Ручная праца (выраб цацак і інш. прадметаў) развівае канструктыўныя здольнасці, дае карысныя практычныя навыкі. Гэтыя віды працы арганізоўваюцца і ў дзіцячых *дашкольных установах* у розных формах (даручэнні, дзяжурствы, калектыўная праца). Вучэбная праца ў дашкольным узросце не набывае самаст. значэння, але пачынае складвацца ў асобны від працы, што важна для падрыхтоўкі дзяцей да школы. Праца навучэнцаў у школе (ручная праца ў пач. класах, заняткі ў вучэбных майстэрнях у сярэдніх класах і вучэбна-выхаваўчая практыка ў старэйшых класах) мае мэтанакіраваны і сістэматычны характар. Асн. час у школьнікаў займае вучэбная праца, якая з'яўляецца сур'ёзным абавязкам навучэнцаў перад грамадствам.

Н.У.Літвіна.

ДЗІЦЯ́ЧАЯ ПСІХАЛО́ГІЯ, галіна псіхалогіі, якая вывучае заканамернасці і факты псіхічнага развіцця дзіцяці. Цесна звязана з сац. псіхалогіяй, *педагогікай*, *фізіялогіяй*, *геранталогіяй* і інш. Дз. п. мае значэнне для практыкі выхавання і навучання ў сям'і, дзіцячых дашкольных установах, школе. Веданне Дз. п. — навук. аснова для распрацоўкі навуч. праграм, дыягностыкі псіхічнага развіцця дзяцей, павышэння эфектыўнасці выхаваўча-адукац. працэсу і інш. Псіхал. метады: назіранне, гутарка, аналіз вынікаў дзіцячай дзейнасці (выяўленчай, муз., мастацка-моўнай) эксперымент, тэставанне і інш. Асн. прадмет Дз.п. — раскрыццё агульных заканамернасцей псіхічнага развіцця ў антагенезе, устанаўленне ўзроставых перыядаў гэтага развіцця (гл. *Узроставая псіхалогія*), прычын і механізмаў пераходу ад аднаго перыяду да другога; важная роля адводзіцца асваенню дзецьмі гісторыка-культ. спадчыны, далучэнню іх да сусв. культуры, сацыялізацыі ў працэсе выхавання і навучання.

Дз.п. ўзнікла ў сярэдзіне 19 ст. Яе стваральнік Д.Тыдэман. У галіне Дз.п. ў розныя часы працавалі В.Прэер, В.Штэрн, К.Грос, І.М.Сечанаў, К.Дз. Ушынскі і інш. Дз.п. стваралася працамі шэрагу вучоных (Ж.Піяжэ, З.Фрэйд, С.Л.Рубінштэйн, М.І.Лысіна, В.В.Давыдаў, В.А.Крупецкі і інш.). У Беларусі праблемы Дз.п. распрацоўваюцца на кафедрах псіхалогіі БДУ, Бел. пед. ун-та, Брэсцкага ун-та, Нац. ін-та адукацыі, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Розныя ўзроставыя перыяды дзяцінства даследавалі бел. вучоныя Л.С.*Выгоцкі*, Р.І.Вадэйка, А.П.Ерась, Е.А.Панько, Ю.М.Карандышаў, Т.М.Савельева, Ф.І. Івашчанка, Н.А.Цыркун, Л.Г.Лысюк, Я.Л.*Каламінскі*, Л.У.Фінкевіч, А.С.Сляповіч і інш.

Літ.: Валлон А. Психическое развитие ребенка. М., 1967; Выготский Л.С. Собр. соч. Т. 4. Детская психология. М., 1984; Бондаренко Е.А. О психическом развитии ребенка. Мн., 1974; Обухова Л.Ф. Детская (возрастная) психология. М., 1996.

Е.А.Панько.

ДЗІЦЯ́ЧАЯ СМЯРО́ТНАСЦЬ, смяротнасць дзяцей да 1 года на 1 тыс. жыванароджаных; адзін з найважнейшых паказчыкаў стану здароўя насельніцтва. Узровень Дз.с. бывае нізкі (да 30%), сярэдні (30—50%) і высокі (больш як 50%). Найб. паказчык Дз.с. — першыя 27 дзён — неанатальная смяротнасць (ранняя — першы тыдзень жыцця і позняя — 8—27 дзён), у наступныя 11

месяцаў — постнеанатальная Дз.с. Перынатальная Дз.с. — мёртванароджаныя, ці Дз.с. у першыя 7 сутак (паказчыкі: да 10—15 % — нізкі, 15—25 — сярэдні, больш як 25% — высокі). Перынатальную Дз.с. падзяляюць на антэнатальную (да родаў), інтранатальную (пры родах) і постнатальную (першы тыдзень). Асн. прычына перынатальнай Дз.с. ў апошнія дзесяцігоддзі — *асфіксія*, расстройствы дыхання, прыроджаныя анамаліі развіцця. Розніца ўзроўню нараджальнасці і смяротнасці вызначае паказчык натуральнага прыросту насельніцтва. На Беларусі Дз.с. складае 12,5% (1996). *Р.У.Дзярфліо.*

ДЗІЦЯ́ЧАЯ ЧЫГУ́НКА, Малая Беларуская чыгунка імя К.С.Заслонава, пазашкольная ўстанова. Адкрыта ў Мінску ў 1955, імя Заслонава прысвоена ў 1971. Дапамагае школе ў навуч.-выхаваўчай рабоце, садзейнічае развіццю тэхн. майстэрства і прафес. арыентацыі навучэнцаў. Пры Дз.ч. працуюць гурткі юных чыгуначнікаў (тэрмін навучання 3 гады, штогод займаецца каля 600 вучняў), якія рыхтуюць машыністаў і памочнікаў машыністаў. Дарога вузкакалейная, працягласць 3 км 790 м з 2 пераездамі і 3 станцыямі. Мае 2 цеплавозы, 6 пасажырскіх вагонаў. Рух паяздоў адбываецца ў маі—жніўні (перавозіцца каля 20 тыс. пасажыраў).

«ДЗІЦЯ́ЧАЯ ЭНЦЫКЛАПЕ́ДЫЯ», шматтомнае універсальнае энцыклапедычнае выданне для дзяцей. Выдадзена ў 1958—77 у Маскве выд-вам «Вялікая Савецкая Энцыклапедыя». Выйшлі 3 выданні: 1-е ў 10 т. (1958—62), 2-е і 3-е ў 12 т. (1964—69 і 1971—77). Прынцып пабудовы ўсіх выданняў «Дз.э.» — тэматычна-алфавітны. Кожны том мае ўласную назву і складаецца з некалькіх раздзелаў (т. 1 — «Зямля», т. 2 — «Свет нябесных цел. Лікі і фігуры», т. 3 — «Рэчывы і энергія», т. 4 — «Расліны і жывёлы» і г.д.), вызначаецца навуковай дакладнасцю, даступнасцю выкладу матэрыялу, багата ілюстравана.

Сярод інш. энцыклапедычных даведнікаў для дзяцей вылучаюцца энцыклапедыя «Што такое. Хто такі» (т. 1—2, 1968, 2-е выд., т. 1—3, 1975—78), а таксама даведнікі для школьнікаў сярэдняга і старэйшага ўзросту: «Энцыклапедычны слоўнік юнага спартсмена» (1979), «Энцыклапедычны слоўнік юнага астранома» (1980, 2-е выд. 1986), «Энцыклапедычны слоўнік юнага хіміка» (1982, 2-е выд. 1990), «Энцыклапедычны слоўнік юнага мастака» (1983), «Энцыклапедычны слоўнік юнага літаратуразнаўца» (1987) і інш. (для юных земляробаў, фізікаў, матэматыкаў, музыкантаў, біёлагаў). *В.К.Шчэрбін.*

ДЗІЦЯ́ЧЫ ДОМ, дзяржаўная выхаваўчая ўстанова для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Дзеці знаходзяцца на поўным дзярж. забеспячэнні. Асн. тыпы Дз.д.: агульныя (для дзяцей ад 3 да 18 гадоў), спец. (для дзяцей з недахопамі развіцця), сямейныя (выхаванцы знаходзяцца ў сем'ях, якія ўзялі 5 і болей дзяцей).

У 19 — пач. 20 ст. ў Расіі для дзяцей-сірот ствараліся дзіцячыя прытулкі і сіроцкія дамы, якія існавалі пераважна на сродкі дабрачынных і філантрапічных т-ваў. Пасля 1917 пераўтвораны ў Дз.д. У 1920—23 існавалі дзіцячыя калоніі і школы-камуны. Спец. Дз.д. былі створаны для дзяцей, бацькі якіх загінулі ў Вял. Айч. вайну. У Беларусі ў 1945 было 245 Дз.д., у 1996/97 навуч. г. — 49 (2545 дзяцей), у т.л. 17 агульнага тыпу (1654 дзіцяці), 10 спец. дамоў (741 дзіця), 22 сямейнага тыпу (150 дзяцей).

ДЗІЦЯ́ЧЫ САД, гл. ў арт. *Дашкольныя ўстановы, Дашкольнае выхаванне і навучанне.*

ДЗІЦЯ́ЧЫ ФАЛЬКЛО́Р, від вуснай нар. паэзіі, творчасць дзяцей і творы, складзеныя для іх дарослымі. Найбольш стараж. від нар. вусна-паэт. творчасці, якая ўвабрала шматвяковы пед. і паэт. вопыт народа. Творы Дз. ф. падзяляюць на 3 групы: паэзія пеставання (калыханкі, забаўлянкі), гульнёвы фальклор (дзіцячыя гульні, лічылкі, згаворы), творы, не звязаныя з гульнямі (песенькі, дражнілкі, заклічкі, некат. загадкі і казкі, асабліва казкі пра жывёл). Дз. ф. ўласціва спалучэнне пазнавальна-выхаваўчай функцыі з мнемanічнай і эстэтычнай.

Пазнавальна-выхаваўчы характар Дз. ф. вызначае маст. форму, рытміку, вобразную сістэму і падбор моўных сродкаў. Для яго характэрна сінкрэтычнасць: элементы музыкі, танца, драмы (жэсты, міміка) спалучаюцца з музыкальнай паэт. мовай, багатай і простай арганізацыяй верша, што актыўна ўплывае на пачуцці і розум дзяцей. На змест і форму кожнай групы твораў Дз.ф. таксама ўплываюць асаблівасці псіхалогіі і светаўспрымання дзяцей у залежнасці ад узросту (калыханкі і забаўлянкі саступаюць месца самаст. дзіцячым гульням і забавам).

У наш час у дзіцячы побыт усё больш пранікаюць творы прафес. мастацтва для дзяцей, *дзіцячай літаратуры*. На Беларусі Дз. ф. збіралі і вывучалі Я.Чачот, А.Рыпінскі, П.В.Шэйн, Е.Р.Раманаў, М.Я.Нікіфароўскі, М.Федароўскі, А.А.Грыневіч, Р.Р.Шырма, Г.І.Цітовіч і інш.

Публ.: Дзіцячы фальклор. Мн., 1972; Гульні, забавы, ігрышчы. Мн., 1996.

Літ.: Гілевіч Н.С. Наша родная песня. Мн., 1968. С. 172—178; Барташэвіч Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мн., 1976; Аникин В.П. Русские народные пословицы, поговорки, загадки и детский фольклор. М., 1957; Довженок Г.В. Український дитячий фольклор: (Віршовані жанри). Київ, 1981.

Г.А.Барташэвіч.

ДЗІЦЯ́ЧЫ ФОНД АРГАНІЗА́ЦЫІ АБ'ЯДНА́НЫХ НА́ЦЫЙ, (United Nations Children's Fund; ЮНІСЕФ). Засн. Ген. Асамблеяй ААН 11.12.1946 як Надзвычайны міжнар. фонд дапамогі дзецям у Еўропе пасля 2-й сусв. вайны. З кастр. 1953 — Дз. ф. ААН. Кіруючы орган — Выканаўчы савет (36 чл., 1997). Сакратарыят ЮНІСЕФ вядзе работу праз свае бюро больш чым у 140 краінах. Штаб-кватэра ў Нью-Йорку. Нобелеўская прэмія міру 1965.

Праекты ЮНІСЕФ у Беларусі ажыццяўляюцца з 1994, прадстаўніцтва адкрыта ў маі 1997 у Мінску. Распрацаваны праграмы супрацоўніцтва ЮНІСЕФ з дзярж. і грамадскімі арг-цыямі Беларусі па асн. кірунках: абарона правоў дзіцяці і рэалізацыя Канвенцыі аб правах дзіцяці; развіццё падлеткаў і моладзі; аказанне дапамогі дзецям-інвалідам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў; здароўе дзяцей і жанчын; ліквідацыя адмоўнага ўздзеяння на дзяцей наступстваў, выкліканых катастрофай на Чарнобыльскай АЭС. *В.У.Радзівіноўскі.*

ДЗІЦЯ́ЧЫЯ ХВАРО́БЫ, група хвароб, што бываюць выключна ці пераважна ў дзяцей і звязаны з асаблівасцямі развіцця іх арганізма. Ва ўлонні маці ўзбуджальнікі інфекц. хвароб (таксаплазмоз, сіфіліс, сываратачны гепатыт, цытамегалія і інш.) праз плацэнту хворай маці пашкоджваюць унутр. органы і ц.н.с. Да заган развіцця плода прыводзіць і ўздзеянне на арганізм маці фіз., хім., біял. фактараў. Пры родах парушэнне кровазвароту ў плацэнце выклікае *асфіксію*, магчымы родавыя траўмы, заражэнне плода. У нованароджаных (да 4 тыдняў) бываюць хваробы, звазаныя з родамі (траўмы, кровазліццё ў мозг, неданошанасць), і выяўляюцца асн. недахопы развіцця плода. Яны асабліва адчувальныя да гнаяроднай інфекцыі, пераахаладжэнняў, хварэюць на сепсіс і запаленне лёгкіх. У грудным узросце бываюць гіпатрафія, паратрафія, *анемія, дыятэз, рахіт*, спазмафілія. Дзеці да 7 гадоў пераважна хварэюць на вострыя дзіцячыя інфекцыі — *адзёр, коклюш, воспу ветраную, шкарлятыну, дыфтэрыю*. У дзяцей малодшага школьнага ўзросту (7—12 гадоў) бываюць гэтыя і інфекц.-алергічныя хваробы — *рэўматызм, астма* бранхіяльная, *нефрыты*. У сярэднім і старэйшым школьным узросце (12—17 гадоў) найчасцей расстройствы нерв. і сардэчна-сасудзістай сістэм, парушэнні абмену рэчываў, дысфункцыя эндакрынных залоз, абвастрэнне інфекц.-алергічных хвароб, туберкулёзу, рэўматызму. З пачаткам палавой спеласці выяўляюцца дэфекты развіцця палавых органаў. *Р.У.Дзярфліо.*

ДЗІЦЯ́ЧЫЯ ЯСЛІ, дашкольная ўстанова, якая забяспечвае неабходныя ўмовы развіцця і выхавання дзяцей ва ўзросце ад 2 месяцаў да 3 гадоў. У Дз.я. вылучаюць 4 ўзроставыя групы: грудных дзяцей (да 9 мес), «паўзунковая» (9—14 мес), сярэдняя (14—24 мес), старэйшая (2—3 гады). Дзяцей, якім споўнілася 3 гады, прымаюць дзіцячыя сады. З 1959 існуе дашкольная ўстанова, якая аб'яднала Дз.я. і дзіцячыя сады ў адзін тып дашкольнай установы — дзіцячыя яслі-сад.

У яслях дзеці знаходзяцца па 10—11 гадз у суткі; існуюць групы падоўжанага і кругласутачнага выхавання. З дзецьмі працуюць сёстры-выхавальніцы, метадычную і выхаваўчую работу ажыццяўляе педагог-метадыст, лячэбна-прафілактычную — урач. Будуюць Дз.я. паводле тыпавых праектаў на 30—40 месцаў; у групе ад 1 да 2 гадоў — 10, ад 2 да 3 га-

доў — 15 месяцаў. У апошнія гады колькасць дзяцей у Дз.я. паменшала ў выніку змены заканадаўства аб працягласці дэкрэтнага адпачынку жанчынам (да 3 гадоў). У 1980 на Беларусі было 229 Дз.я. на 20,6 тыс. дзяцей, у 1996 — 17 Дз.я. на 0,8 тыс. дзяцей. Гл. таксама *Дашкольныя ўстановы, Дашкольнае выхаванне і навучанне.* *Э.А.Вальчук.*

ДЗІ́ЧКА, 1) у садоўніцтве — маладое дрэўца, якое вырошчваюць з насення на прышчэпу ці самасейнае. Дз. наз. таксама плод дзікай грушы ці яблыні. 2) У лесаводстве — 2—3-гадовае дрэўца, якое выросла ў лесе з насення і выкарыстоўваецца як пасадачны матэрыял.

ДЗІЧЫ́НА, птушкі і звяры, якіх здабываюць паляваннем і мяса якіх ідзе ў ежу. Выкарыстоўваюць таксама пух, пер'е, шкуры, рогі. Дз. падзяляюць на птушыную (баравую, ці лясную, вадаплаўную, балотную, палявую і стэпавую) і 4-ногую (пераважна зайцы і капытныя). На Беларусі водзяцца: з 4-ногай Дз. лось, дзік, алень, казуля, заяц-русак; з баравой — глушэц, цецярук, рабчык, вяхір, клінтух, слонка; з вадаплаўнай — гусі, качкі, паганкі, крахалі, лысуха; з балотнай і лугавой — бакас, дупель, драч і інш. кулікі і пастушкі; з палявой і стэпавай — перапёлка, шэрая курапатка. Паляванне на рэдкія, знікаючыя і асабліва каштоўныя віды Дз. забаронена або дазваляецца па ліцэнзіях (лось, дзік, курапаткі, казулі, высакародны алень, глушэц). Для павелічэння запасаў Дз. праводзяцца мерапрыемствы па *дзічынаразвядзенні.*

ДЗІЧЫНАРАЗВЯДЗЕ́ННЕ, штучнае развядзенне паляўнічай птушкі і часткова млекакормячых (пераважна зайцоў) для павелічэння іх колькасці ў паляўнічых угоддзях. Заключаецца ў гадоўлі племянных птушак у гадавальніках, інкубаванні іх яек і вырошчванні птушанят да пэўнага ўзросту, пасля чаго іх выпускаюць ва ўгоддзі. Дз. развіта ў многіх краінах Еўропы і Паўн. Амерыкі, дзе стала асн. спосабам узнаўлення *дзічыны.* Дазваляе падтрымліваць на аптымальным узроўні колькасць жывёл і ствараць устойлівыя папуляцыі каштоўных відаў, вырашаць асобныя праблемы аховы жывёл. На Беларусі гал. аб'екты Дз. — качка, фазан, глушэц. Пытанні Дз. распрацоўваюць у запаведніках, нац. парках і асобных паляўнічых гаспадарках.

ДЗІЯМІ́ДА АСТРАВЫ́, два астравы і скалы ў Берынгавым праліве. Зах. в-аў Ратманава (пл. каля 10 км²) належыць Расіі, усх. в-аў Крузенштэрна і скала Фэруэй — ЗША. Адкрыты ў 1728 экспедыцыяй В.Берынга.

ДЗІЯНІ́СІЙ [каля 1440 — пасля 1502—03(?)], рускі жывапісец. Працаваў пераважна ў Маскве і сярэднярус. манастырах. Большасць твораў Дз. не захавалася і вядома па пісьмовых крыніцах. Абразам Дз., з іх вытанчаным малюнкам і каларытам, з вельмі выцягнутымі, грацыёзнымі фігурамі, уласцівы ўзнёсласць і ўрачыстасць: «Божая Маці Алзігітрыя» (1482), «Спас у сілах» і «Распяцце» (абодва 1500); абразы для Ферапонтава манастыра і размалёўкі яго сабора выкананы разам з сынамі Уладзімірам і Феадосіем (1500—02 ці 1502—03). Дз. прыпісваюць таксама абразы «Мітрапаліт Пётр у жыцці», «Мітрапаліт Аляксій у жыцці» і інш.

Літ.: Данилова И.Е. Фрески Ферапонтова монастыря. М., 1970.

Дзіянісій. Распяцце. Абраз. 1500.

ДЗМІ́ТРАВІЧЫ, вёска ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., на р. Брусята, на аўтадарозе Бераэіно — г.п. Бобр. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 22 км на ПнУ ад г. Бераэіно, 125 км ад Мінска, 45 км ад чыг. ст. Бобр. 497 ж., 182 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан.

ДЗМІ́ТРАВІЧЫ, вёска ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Камянец — в. Камянюкі. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на Пн ад Камянца, 49 км ад Брэста, 37 км ад чыг. ст. Жабінка. 647 ж., 193 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Праабражэнская царква (1786).

ДЗМІТРАЧЭ́НКА Аляксандр Пятровіч (1.9.1900, г.п. Ула Віцебскай вобл. — 8.8.1981), савецкі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Акад. УАСГНІЛ (1967). Засл. дз. нав. РСФСР (1961). Герой Сац. Працы (1966). Скончыў Сцебутаўскі с.-г. ін-т (1922). Працаваў у ВНУ Ленінграда (у 1930—35 і з 1946) і Валагодскім малочным ін-це (у 1939—46). Навук. працы па пытаннях эфектыўнасці выкарыстання і ацэнцы пажыўнасці кармоў, тыпізацыі кармлення с.-г. жывёл, распрацоўцы прынцыпаў нармавання кармлення з выкарыстаннем ЭВМ для складання аптымальных рацыёнаў.

Тв.: Методы нормирования кормления сельскохозяйственных животных. Л., 1970 (у сааўт.).

ДЗМІТРУ́К Аляксей Данілавіч (24.4.1907, в. Сцяброва Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. — 23.8.1942), удзельнік рэв. руху ў Зах. Беларусі і партыз. руху ў Вял. Айч. вайну. Вучыўся ў школе парт. работнікаў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б у Мінску (1932—33). З 1926 сакратар Жабінкаўскага падп. райкома, інспектар ЦК КПЗБ па Пінскім акр. к-це КПЗБ. Двойчы (1927, 1934) быў арыштаваны польск. ўладамі і зняволены ў турму. З 1939 у БССР, працаваў у міліцыі. У Вял. Айч. вайну партызан атрада імя М.М.Чарнака партыз. брыгады імя Сталіна Брэсцкай вобл. Загінуў пры выкананні баявога задання.

ДЗМІТРУ́К Праскоўя Фёдараўна (15.10.1899, в. Ліскі Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. — 22.12.1978), удзельніца рэв. руху ў Зах. Беларусі. У 1-ю сусв. вайну ў бежанцах у Арэхава-Зуеве. Чл. КПЗБ з 1924. У 1926—33 сакратар Гродзенскага акругкома КПЗБ, працавала ў Пінскім, Баранавіцкім, Беластоцкім, Брэсцкім, Віленскім і Кракаўскім акругкомах КПЗБ (парт. псеўд. Маруся, Надзя, Вера, Галубок і інш.). У 1925—26 вучылася ў школе парт. работнікаў Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б у Мінску, у 1929—31 — у Камуніст. ун-це нац. меншасцей імя Ю.Ю.Мархлеўскага ў Маскве. У 1933 арыштавана польск. ўладамі і асуджана на 10 гадоў турмы. Дэп. Нар. сходу Зах. Беларусі (28—30.10.1939, Беласток). У 1939—41 і 1945—55 на сав. рабоце ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл. *М.П.Клімец.*

ДЗМІ́ТРЫЕВА Зінаіда Аляксандраўна (15.6.1925, г.п. Струці-Красныя Пскоўскай вобл., Расія — 4.1.1989), бел. вучоны ў галіне бульбаводства. Д-р с.-г. н. (1976), праф. (1979). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыла Ленінградскі с.-г. ін-т (1950). З 1957 у Бел. НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва (у 1964—82 нам. дырэктара). Навук. працы па ўдасканаленні спосабаў вырошчвання бульбы ва ўмовах механізаванай вытв-сці, распрацоўцы тэхналогіі вырошчвання бульбы з дробных пасадачных клубняў.

Тв.: Прогрессивная технология возделывания картофеля. Л., 1976 (разам з М.А.Дарожкіным, В.В.Валуевым); Как вырастить высококачественный столовый картофель. Мн., 1983; Справочник картофелевода. 2 изд. Мн., 1989 (у сааўт.).

ДЗМІ́ТРЫЕВА-БА́ЛАШ Ганна Яраславаўна (н. 27.5.1964, Мінск), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Вучылася ў творчай майстэрні В.Ф.Сумарава (1972—78), скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1987). Працуе ў галіне тэкстылю і мадэліравання. Стварае аб'ёмныя тэкст. кампазіцыі з выкарыстаннем тэхнік габелена, ціснення па скуры, вышыўкі, аплікацыі, калажа, жывапісу і інш.: «Цар-царыца» (1987), «Салавей і ружа» (1996), «Дзівосная краіна» (1997), «Раніца ў Венецыі», «Мурашыная каралева», «Развітанне славянкі» (усе 1990-я г.; з С.Даманавай), пано «Мой горад» (1997). Мастак-пастаноўшчык тэлефільма «Пастка для зубра» (1992—94). Афармі-ла сцэн. касцюмы ансамблям «Харошкі», «Крупіцкія музыкі», «Камерата» і інш.

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Аляксандр Іванавіч (14.10.1878, С.-Пецярбург — 2.12.1959), рускі архітэктар і інжынер. Акад. архітэктуры (1912). Скончыў Ін-т грамадзянскіх інжынераў (1900) і арх. аддзяленне АМ (1903) у Пецярбургу. Аўтар збудаванняў, выкананых у гіст. стылі: Нахімаўскае вучылішча (б. Вучылішчны дом Пятра I, 1908—12) у Пецярбургу, Дом упраўлення Паўд. чыгункі (1908—10), Палац культуры чыгуначнікаў (б. Палац рабочага, 1931—32) у Харкаве, праектаў тыпавых будынкаў для раёнаў Крайняй Поўначы (1948—59) і інш.

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Аляксандр Сяргеевіч (н. 19.1.1935, С.-Пецярбург), рускі дырыжор. Нар. арт. СССР (1990). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1958). У 1968—69 удасканальваў майстэрства ў Х.Свароўскага (Вена) і Я.*Мравінскага*. З 1960 гал. дырыжор сімф. аркестра Карэльскага радыё і тэлебачання, з 1971 — ленінградскага Малога т-ра оперы і балета, з 1977 — акад. сімф. аркестра С.-Пецярбургскай філармоніі імя Дз.Шастаковіча. У 1971—94 выкладаў у С.-Пецярбургскай кансерваторыі. На кантрактнай аснове працуе за мяжой, гал. дырыжор філарманічнага аркестра ў г. Осла. Пад яго муз. кіраўніцтвам пастаўлены шэраг опер і балетаў. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу дырыжораў (1966).

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Андрэй Сяргеевіч (29.6.1925, С.-Пецярбург — 13.4.1989),

А.С.Дзмітрыеў.

бел. вучоны-фізіёлаг. Акад. АН Беларусі (1974, чл.-кар. 1972), д-р біял. н. (1970), праф. (1971). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1954). З 1957 вучоны сакратар, з 1960 нам. дырэктара, адначасова (з 1970) заг. лабараторыі Ін-та фізіялогіі АН Беларусі. З 1973 Гал. вучоны сакратар Прэзідыума АН Беларусі, у 1978—87 віцэ-прэзідэнт АН Беларусі. Навук. працы па вывучэнні ўздзеянняў гравітацыі і вібрацыі на арганізм чалавека і жывёлы. Выявіў структурна-функцыян. арганізацыю некат. саматычных і вегетатыўных рэакцый арганізма на ўздзеянне дынамічных фактараў, вызначыў некат. механізмы ўзнікнення і развіцця гэтых рэакцый. Даследаваў ролю мацярынскага арганізма пры адаптацыі эмбрыёна і плода да пастаяннага ўздзеяння паскарэння і вібрацыі і механізмы фарміравання ў эмбрыягенезе і антагенезе кампенсаторных нейрагумаральных рэакцый арганізма на ўздзеянне гэтых фактараў.

Тв.: Лабиринтные и экстралабиринтные механизмы некоторых соматических и вегетативных реакций на ускорение. Мн., 1969.

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Барыс Міхайлавіч (11.6.1924, Масква — 23.2.1944), удзельнік партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў спец. школу падрыўнікоў-мінёраў (1942). З чэрв. 1942 у партызанах у Асіповіцкім р-не. Удзельнічаў у падрыве 18 варожых эшалонаў. 23.2.1944 у баі за апорны пункт партызан у в. Каменічы замяніў загінуўшага камандзіра групы, паранены, працягваў бой. Калі скончыліся патроны, гранатай падарваў сябе і ворагаў, што наблізіліся да яго.

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Вікенцій Дзмітрыевіч (н. 29.3.1931, с. Гаранава Ленінградскай вобл., Расія), бел. трэнер па спартыўнай гімнастыцы. Засл. трэнер СССР (1966). Засл. трэнер Беларусі (1964), засл. дзеяч фізічнай культуры Беларусі (1968). Засл. настаўнік Беларусі (1965). З 1966 старшы трэнер спецыялізаванай школы алімпійскага рэзерву (г. Віцебск). Сярод яго выхаванцаў алімп. чэмпіёнкі Т.Лазаковіч, Л.Петрык, чэмпіёнкі СССР Л.Аргучынская, С.Кудзінава, С.Маскалёва.

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Генадзь Рыгоравіч (н. 18.10.1943, в. Першамайка Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1970). Працаваў на будоўлі, настаўнічаў. Друкуецца з 1960. Выдаў зб-кі «Гарады на далонях» (1974), «Азярыны» (1980), для дзяцей — «Пітушка Сінязорка» (1976). У вершах адлюстравана біяграфія аўтара — праца на будоўлі, армейская служба, маральны вопыт перажытага, адчуваецца схільнасць да разваг, да інтанацыйна вольнага выказвання. Паэт умее прыкмячаць глыбінныя ўласцівасці з'яў, харство прыроды, чалавечай душы. *А.М.Пяткевіч.*

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Міхаіл Аляксеевіч (1832, С.-Пецярбург — 26.5.1873), рускі і бел. этнограф, фалькларыст, педагог. Скончыў Гал. пед. ін-т у Пецярбургу (1853). З 1853 настаўнік дваранскага вучылішча, пасля дырэктар гімназіі ў Навагрудку. Першы дырэктар (1867—73) Гродзенскай дырэкцыі нар. вучылішчаў. Чл. Рус. геагр. т-ва. Даследаваў матэрыяльную і духоўную культуру бел. народа, запісваў бел. фальклор. Зрабіў апісанне шматлікіх нар. абрадаў і звычаяў, побыту («Вясельны абрад у вёсках Навагрудскага павета», 1861, «Апісанне пахаванняў і дзядоў у Навагрудскім павеце Мінскай губерні», 1867, «Норавы і звычаі заходнярускага народа», 1868, і інш.). Бел. казкі дасылаў рус. фалькларысту А.М.*Афанасьеву*, які публікаваў іх па-беларуску ў сваіх «Народных рускіх казках». Запісваў бел. тапанімічныя і міфалагічныя легенды («Возера Свіцязь», 1860, «Паданне пра Лоўчыцы», 1861). У зб. «Спроба збірання песень і казак сялян Паўночна-Заходняга краю» (1868) апубл. урывак з твора Я.Баршчэўскага «Рабункі мужыкоў», бел. ана-

Г. **Дзмітрыева-Балаш**. Кампазіцыя «Развітанне славянкі». 1997.

німны верш «Кінуў-рынуў паўстанне». У «Зборы песень, казак, абрадаў і звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю» (1869) змясціў 277 каляндарна-абрадавых, сямейна-бытавых песень, 8 казак, апісанні абрадаў, нар. гульняў, забаў, танцаў. Частка рукапіснай спадчыны Дз. зберагаецца ў архівах Геагр. т-ва і Б-кі Расійскай АН у Санкт-Пецярбургу і ў Цэнтр. гіст. архіве Літвы (Вільнюс).

Тв.: Несколько слов краткого исторического обозрения русско-литовского Новогрудка... // Вестн. имп. Рус. геогр. об-ва. 1858. Ч. 24; Собрание дальнейших исторических сведений о Новогрудке со смерти Свенторога (1270) // Там жа. 1859. Ч. 26; Обряды и обычаи западнорусских крестьян // Памятная книжка Гродненской губернии на 1869 г. Гродно, 1869; Воскресные школы в Гродненской губернии // Циркуляр по Московскому Учебному округу. 1868. № 12. *І.У.Саламевіч.*

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Міхаіл Апанасавіч (н. 23.9.1921, в. Барсукі Кармянскага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1993), праф. (1994). Чл.-кар. Бел. акадэміі адукацыі (з 1995). Засл. настаўнік БССР (1964). Скончыў БДУ (1950). Працаваў настаўнікам. З 1974 рэктар Мазырскага пед. ін-та. З 1985 у Гомельскім ун-це. Аўтар прац па гісторыі педагогікі і асветы, тэарэтычна-метадычных праблемах адукацыі і навучання, працоўнага выхавання («Тэксты лекцый па дыдактыцы», 1981; «Тэорыя адукацыі і навучання», 1989, і інш.).

ДЗМІ́ТРЫЕЎ Юрый Арсеньевіч (н. 3.12.1911, Масква), рускі тэатразнавец. Д-р мастацтвазнаўства (1949). Праф. (1950). Засл. дз. маст. Расіі (1991). Скончыў Ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1935), дзе і выкладаў з 1936. У 1965—90 заг. сектара т-ра народаў СССР ва Усесаюзным НДІ мастацтвазнаўства. Займаўся гісторыяй рус. і сав. т-ра, цырка, эстрады. У кола яго навук. інтарэсаў уваходзілі пытанні развіцця бел. сцэн. мастацтва. Значны яго ўклад у падрыхтоўку кадраў тэатразнаўцаў Беларусі (А.Бутакоў, Э.Герасімовіч, У.Няфёд, А.Лабовіч, Т.Арлова, А.Сабалеўскі, Р.Смольскі).

ДЗМІ́ТРЫЙ АЛЬГЕ́РДАВІЧ (пасля 1347—99), князь у ВКЛ, сын *Альгерда* і Марыі Яраслаўны Віцебскай. Упершыню ўпамінаецца як князь у г. Трубчэўск (на Браншчыне), які разам з г. Стародуб у 1378 добраахвотна здаў свайму брату *Андрэю Альгердавічу* (на той час прыхільніку Масквы). На баку вял. кн. маскоўскага Дзмітрыя Іванавіча Данскога ўдзельнічаў у *Кулікоўскай бітве 1380*. Вярнуўшыся ў ВКЛ, прысягнуў на вернасць Ягайлу (16.12.1388). Загінуў у *бітве на Ворскле 1399*. *М.І.Ермаловіч.*

ДЗМІ́ТРЫЙ ІВА́НАВІЧ (19.10.1582, Масква — 15.5.1591), расійскі царэвіч. Малодшы сын *Івана IV Васілевіча* Грозная. Пасля смерці бацькі (1584) саслан з маці (М.Ф.Нагой) у г. Угліч, дзе памёр пры нявысветленых абставінах (магчыма, у час эпілептычнага прыпадку або забіты паводле загаду *Барыса Гадунова*). Імя Дз.І. выкарыстоўвалі ў 1604—12 *Лжэдзмітрый I, Лжэдзмітрый II* і інш. самазванцы. У 1606 кананізаваны царквой і перапахаваны ў Маск. Архангельскі сабор.

Літ.: Скрынников Р.Г. Борис Годунов. М., 1983. С. 67—84; Яго ж. Самозванцы в России в начале XVII в.: Григорий Отрепьев. 2 изд. Новосибирск, 1990. С. 10—18; Зимин А.А. В канун грозных потрясений: Предпосылки первой крестьянской войны в России. М., 1986. С. 153—182.

ДЗМІ́ТРЫЙ ІВА́НАВІЧ ДАНСКІ́ (12.10.1350, Масква — 19.5.1389), вялікі князь маскоўскі (з 1359) і ўладзімірскі (з 1362). Сын *Івана II Іванавіча*. Пры ім у 1367 у Маскве пабудаваны першы ў Паўн.-Усх. Русі белакаменны крэмль. У 1368 і 1370 яго войскі адбілі напады на маск. княства войска *Альгерда*, у 1371 — разанскага кн. Алега Іванавіча. У 1376 замацаваны ўплыў Масквы ў Балгарыі Волжска-Камскай. У сваёй палітыцы абапіраўся на аўтарытэт і падтрымку *Сергія Раданежскага*. Дз.І.Д. першы з маск. князёў узначаліў барацьбу супраць татара-манголаў і перамог іх на р. Вожа (1378) і ў *Кулікоўскай бітве 1380*, што паклала пачатак вызваленню Русі ад татара-манг. панавання. За гэту бітву прозваны Данскім. Пасля зруйнавання Масквы тат. ханам Тахтамышам (1382) аднавіў горад. Пры ім Масква замацавала кіруючае становішча ў рус. землях. Упершыню без згоды Залатой Арды завяшчаў вял. княжанне свайму сыну Васілю. Кананізаваны.

Літ.: Кучкин В.А. Дмитрий Донской // Вопр. истории. 1995. № 5—6.

ДЗМІ́ТРЫЙ РАСТО́ЎСКІ, Дзіміт рый (свецкае Туптала Данііл Савіч; снежань 1651, мяст. Макарава каля Кіева — 8.11.1709), украінскі і рус. царк. і культ. дзеяч, асветнік. Вучыўся ў Кіева-Магілянскай калегіі (1662—65). У 1668 прыняў манаства, у 1675 пасвячоны ў іераманахі. Быў ігуменам у розных манастырах на Украіне. З 1702 мітрапаліт у Растове, заснаваў там семінарыю. Сярод яго шматлікіх маральна-павучальных, багаслоўскіх, драм. твораў найб. вядомыя 4-томны зб. «Чэцці-Мінеі» («Кніга жыцій святых»), выд. ў 1689, 1695, 1700, 1705. Філасофію разглядаў як неабходны элемент рэліг. вопыту. У духу містычнай плыні праваслаўя *ісіхазму* лічыў, што свет прасякнуты боскімі дзеяннямі, якія адкрываюцца чалавеку ў прыгажосці і гармоніі прыроды. На яго думку, узаемаадносіны душы і цела маюць характар антаганізму, бо ў адносінах да душы цела — турма; таму адной з жыццёвых мэт з'яўляецца ўстанаўленне панавання душы над целам. Выкрывальнік стараверства (кн. «Вышук пра раскольніцкую брынскую веру...», выд. 1745). Кананізаваны ў 1757.

Тв.: Сочинения святителя Димитрия, митрополита Ростовского. Ч. 1—5. Киев, 1895—1905; Жития святых на русском языке, изложенные по руководству Четий-Миней св. Димитрия Ростовского с дополнениями из Пролога. Т. 1—12. М., 1902—11.

ДЗМІ́ТРЫЙ-КАРЫБУ́Т (?—пасля 1404), князь у ВКЛ, гл. *Карыбут*.

ДЗМІТРЭ́ЎСКІ Іван Апанасавіч (11.3.1734, г. Яраслаўль, Расія — 8.11.1821), рускі акцёр, рэжысёр, педагог, тэатр. дзеяч. Найб. значны прадстаўнік рус. сцэн. класіцызму. Правадзейны чл. Расійскай акадэміі (1802). Паплечнік Ф.*Волкава* па стварэнні т-ра ў Яраслаўлі. З 1756 у Пецярбургу ў трупе першага рус. пастаяннага публічнага т-ра. Сярод лепшых роляў: Сінаў, Дзмітрый («Сінаў і Трувор», «Дзмітрый Самазванец» А.Сумарокава), Альцэст («Мізантроп» Мальера), Валер («Гулец» Ж.Ф.Рэньяра), Усердаў («Усеагульнае апалчэнне» С.Віскаватава). Першы пастаноўшчык «Недаростка» Дз.Фанвізіна (1782) і выканаўца ролі Стародума.

ДЗУГА́ЕЎ (Дзугаты) Георгій Хасакоевіч (28.3.1911, с. Дзугатыкау Джаўскага р-на, Паўд. Асеція — 1985), асецінскі пісьменнік. Друкаваўся з 1935. Аўтар паэт. зб-каў «Прамень сонца» (1938), «Ключ сэрца» (1959), «Запявала» (1967), «Сонечныя блікі» (1979), раманаў «На вастрыі клінка» (1964), «Залатая крыніца» (1974, Літ. прэмія імя К.Хетагурава 1976) і інш. Пераклаў на асецінскую мову кнігу выбр. лірыкі бел. паэтаў «Песня, апаленая вайной» (1976), асобныя творы Я.Купалы, П.Броўкі, М.Калачынскага. На бел. мову творы Дз. перакладалі Калачынскі, Г.Кляўко, Ю.Свірка.

ДЗУ́КІ, этнаграфічная група літоўцаў. Жывуць на ПдУ Літвы (у раёне г. Друскінінкай, Ігналіна, Тракай, Шальчынінкай, Швянчоніс і інш.), на ПнУ Польшчы і ў Зах. Беларусі (Воранава, Гервяты, Радунь). Займаюцца земляробствам, жывёлагадоўляй, пчалярствам. Традыцыйная вопратка — спадніцы ў клетку, тканыя паясы. Посцілкі і ручнікі побач з геам. арнаментам упрыгожваліся і раслінным узорам. Пашыраныя стравы: халодны боршч, аладкі з цёртай бульбы. Да сярэдзіны 20 ст. зберагалі самабытнасць вопраткі, харчавання, грамадскага жыцця. У 2-й пал. 19 — 1-й пал. 20 ст. частка Дз. асімілявана беларусамі і палякамі.

ДЗЬЕНБ'ЕНФУ́ (Diên Bien Phu), мясцовасць на ПнЗ В'етнама каля граніцы з Лаосам, дзе адбыліся вырашальныя баі на заключным этапе Індакітайскай вайны 1946—54. Стратэгічна важны ў ваен. адносінах раён Дз. 20.3.1953 у выніку паветрана-дэсантнай аперацыі занялі франц. экспедыцыйныя войскі, якія пазней ператварылі яго ў добра ўмацаваны рубеж абароны (49 апорных пунктаў, 15—16-тыс. гарнізон на чале з ген. Дэ Кастры). У ходзе цяжкіх баёў 13.3—7.5.1954 часці В'етнамскай нар. арміі на чале з Во Нгуен Зіяпам блакіравалі раён Дз. і паступова авалодалі ўсімі яго ўмацаваннямі, што паскорыла заканчэнне вайны і вызваленне В'етнама з-пад франц. панавання.

ДЗЬЁР (Győr), горад на ПнЗ Венгрыі. Адм. ц. медзье Дзьёр-Шопран. Узнік на месцы стараж.-рым. паселішча Арабона. 130,9 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт пры ўпадзенні р. Раба ў суднаходную пратоку р. Дунай. Машынабудаванне і металаапрацоўка (вытв-сць партальных кранаў, канструкцый мастоў, пад'ёмна-трансп. абсталявання, с.-г. машын, вагона- і дызелебудаванне), прам-сць тэкст., харч., хім. (вытв-сць сінт. скуры), дрэваапрацоўчая. Музеі. Сабор (12—19 ст.), цэрквы ў стылі барока.

ДЗЬМУХАВЕ́Ц, адуванчык (Taraxacum), род кветкавых раслін сям. астравых. Каля 2000 відаў. Пашыраны ў халодных, умераных і субтрапічных паясах, у высакагор'і тропікаў. На Беларусі больш за 10 відаў, з якіх найб. вядомы Дз. лекавы (T. officinale). Нар. на-

Дзьмухавец лекавы.

звы малачай, багатка, коцікі, папок, дмухель, зубнік, жоўтая цыкор'я. Расце каля жылля, уздоўж дарог, на агародах, палях, лугах і інш. У якасці тэхн. (для атрымання натуральнага каўчуку) расліны раней вырошчвалі Дз. кок-сагыз (T. kok-saghyz).

Шматгадовыя травяністыя расліны са стрыжнёвым коранем і бязлістымі, полымі ўнутры сцяблами (стрэлкамі) выш. 10—30 см. Лісце ў прыкаранёвай разетцы, ланцэтнае, зубчастае, паступова звужанае ў чаранок. Кветкі двухполыя, звычайна жоўтыя, радзей белыя і ружовыя, сабраны ў адзіночныя верхавінкавыя кошыкі. Плод — сямянка, з носікам і чубком. Лек.,' кармавыя, меданосныя, харч. і тэхн. расліны. Карані выкарыстоўваюцца для ўзбуджэння апетыту, як сурагат кавы, лісце на салату, кветкавыя кошыкі — для прыгатавання варэння, напіткаў і інш.

Г.У.Вынаеў.

ДЗЬЮА́Р (Dewar) Джэймс (20.9.1842, г. Кінкардзін-он-Форт, Вялікабрытанія — 27.3.1923), англійскі фізік і хімік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1877). Скончыў Эдынбургскі ун-т (1861). З 1875 праф. Кембрыджскага ун-та, з 1897 прэзідэнт Хім. т-ва Англіі. Асн. працы па вывучэнні цеплавых з'яў. Распрацаваў метады вымярэння цеплаёмістасці пры нізкіх т-рах, упершыню атрымаў вадкі вадарод (1898), даследаваў змены электраправоднасці металаў у залежнасці ад т-ры. Вынайшаў пасудзіну, у якой целы могуць доўгі час захоўваць сваю т-ру (гл. *Дзьюара пасудзіны*). Разам з П.Кюры даказаў, што пры радыеактыўным распадзе радону ўтвараецца гелій (1904).

ДЗЬЮА́РА ПАСУ́ДЗІНЫ (ад прозвішча Дж. *Дзьюара*), пасудзіны з падвойнымі сценкамі, паміж якімі ствараецца высокі вакуум (з ціскам да 1,3 мПа). Служаць для цеплаізаляцыі рэчываў, што



Дзьюара пасудзіны: *а* — шкляная лабараторная; *б* — металічная прамысловая для вадкага гелію або вадароду (1 — адсарбцыйная камера, 2 — вакуумная шматслойная ізаляцыя, 3 — вадкі азот для ахаладжэння, 4 — экран, 5 — вакуумная прастора).

змяшчаюцца ў іх пры нізкай або высокай т-ры.

Невял. пасудзіны робяць з высокатрывалага шкла, значнага аб'ёму для прамысл. выкарыстання — з металу. З-за высокага вакууму паміж сценкамі практычна адсутнічае канвекцыйны цеплаабмен. Прамянёвы цеплаабмен памяншаюць паліраваннем і пакрыццём унутр. сценак тонкім слоем серабра, выкарыстаннем матэрыялаў з малым каэф. цеплаправоднасці. Пасудзіны для вадкага гелію і вадароду маюць экран, які ахаладжаецца вадкім азотам або паветрам. Дз.п. выкарыстоўваюць для захоўвання і перавозкі звадкаваных газаў, захоўвання рэчываў (тэрмасы), у крыягеннай тэхніцы (крыястаты), у электроніцы і навук. даследаваннях.

ДЗЬЮ́ЗЕНБЕРЫ (Duesenberry) Джэймс Стэмбел (н. 18.2.1918, г. Прынстан, штат Зах. Віргінія, ЗША), амерыканскі эканаміст. Скончыў Мічыганскі ун-т (1938). Выкладаў і вёў н.-д. працу ў Кембрыджскім ун-це (1954—55), Фондзе Форда (1958—59). З 1956 кансультант К-та эканам. развіцця, праф. Гарвардскага ун-та. У працы «Даход, зберажэнні і тэорыя паводзін спажыўца» (1949) спрабаваў развіць некат. палажэнні эканам. дактрыны Дж.Кейнса аб сувязі паміж даходамі і расходамі спажыўца. Паводле Дз., узровень попыту вызначаецца не абсалютнай, а адноснай велічынёй даходу спажыўца, псіхал. і сац. фактарамі. У 1960-х г. апублікаваў працу па тэорыі эканам. цыкла, грашовага абарачэння і крэдыту, удзельнічаў у распрацоўцы мадэлей эканам. росту.

ДЗЬЮ́І (Dewey) Джон (20.10.1859, г. Берлінгтан, штат Вермонт, ЗША — 1.6.1952), амерыканскі філосаф, псіхолаг і педагог, адзін з вядучых прадстаўнікоў прагматызму. Скончыў Вермонцкі ун-т (1879). Праф. Мічыганскага (1889—94), Чыкагскага (1894—1904) і Калумбійскага (1904—30) ун-таў. Развіў новы кірунак прагматызму — *інструменталізм*, распрацаваў прагматысцкую метадалогію ў галіне логікі і тэорыі пазнання. Паводле Дз., адрозненні суб'екта і аб'екта, псіхічнага і фізічнага — гэта толькі адрозненні ўнутры «вопыту», які ўключае арганізм і асяроддзе, усведамленне чалавека і прыроду. Пазнанне ён трактаваў у духу біхевіярызму, як складаную форму паводзін, канчаткова — сродак барацьбы за біял. выжыванне. Этычная канцэпцыя Дз. зыходзіць з таго, што дабро з'яўляецца унікальным, устойлівых агульных нормаў маральнасці няма і вырашэнне этычных праблем з'яўляецца сітуацыйным. Стваральнік педацэнтрычнай тэорыі і методыкі навучання (гл. *Педацэнтрызм*), у аснове якой прынцып навучання шляхам фарміравання практычных навыкаў. Аўтар прац «Філасофія і цывілізацыя» (1931), «Вопыт і прырода» (1934), «Праблемы чалавецтва» (1946) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Введение в философию воспитания. М., 1921; Психология и педагогика мышления. 2 изд. Берлин, 1922; Школы будущего. М., 1922; Школа и общество. М., 1925.

В.М.Пешкаў.

ДЗЬЯЧКО́Ў Іван Пятровіч (1789 — пасля 1836), бел. архітэктар 19 ст. Прадстаўнік класіцызму. Да 1813 працаваў у Маскве. З 1814 жыў і працаваў у Гомелі, у графа М.П.Румянцава. Асн. пабудовы паводле праектаў Дз. ў Гомелі: дваранскае вучылішча (1818), Гомельскі «паляўнічы домік», ткацкая і бялільная ф-кі (усе 1818—20); кіраваў буд-вам ланкастэрскай школы (1818) і «Рускага шынка» (1822).

ДЗЬЯЧЭ́НКА Ніна Мікалаеўна (н. 23.7.1944, г. Чыта, Расія), артыстка балета, балетмайстар. Засл. арт. Расіі (1973). Скончыла Пермскае харэаграфічнае вучылішча (1963), выкладала ў ім (1965—85). Працавала ў Львоўскім (з 1963) і Пермскім (з 1965) т-рах оперы і балета [сярод партый: Мерседэс («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Зарэма («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Эгіна («Спартак» А.Хачатурана), Кармэн («Кармэн-сюіта» Ж.Бізе—Р.Шчадрына)]. З 1986 педагог-рэпетытар Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1988 педагог Бел. харэаграфічнага вучылішча, з 1992 балетмайстар, з 1993 гал. балет-

майстар Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі. Сярод пастановак: балеты «Іспанскі дывертысмент», «Зачараваны прынц» на муз. П.Чайкоўскага, харэаграфія спектакляў «Хэло, Долі!» Дж.Германа, «Халопка» М.Стрэльнікава, «Вясёлая ўдава» Ф.Легара, «Капялюш Напалеона» О.Штрауса, «Цыганскі барон» І.Штрауса.

ДЗЭН (яп., ад санскр. дх'яна — медытацыя), адна з плыней у яп. будызме. Сфарміравалася на аснове чань-будызму, прыйшла ў Японію з Кітая ў канцы 12 ст. Асн. ідэя Дз. — магчымасць спасціжэння пры дапамозе медытацыі сваёй пачатковай прыроды, тоеснай «сутнасці Буды». Прабуджэнне (саторы) суадносяць з пасціжэннем сапраўднай прыроды рэчаў, іх патаемнай сутнасці і ўсведамленнем свайго дачынення да ўсяго існага. Адрозніваюць «малое саторы», калі сапраўднае разуменне рэчаў толькі прыадкрываецца на кароткі момант, і «вялікае саторы», што вядзе да духоўных змен. Для дасягнення саторы выкарыстоўваюць «сядзячую медытацыю», якая прадугледжвае пазбаўленне ад думак і вобразаў (даадзэн) і практыку пастаноўкі і рашэння асобых парадаксальных задач, накіраваных на фарміраванне інтуітыўнага цэласнага спасціжэння рэальнасці (коан). Найб. пашыраны кірунак Дз. Рындзай-сю, успрыняты імператарскім акружэннем, самурайствам. Другі кірунак, Сота-сю, распаўсюдзіўся ў правінцыях, знайшоў падтрымку ў мясц. феадалаў. Паслядоўнікі Дз. лічаць свяшчэнныя трактаты другаснымі, бо патаемныя ісціны перадаюцца непасрэдна ад настаўніка вучню («ад сэрца да сэрца»). Дз. у многім вызначыў кодэкс самурайскага гонару *бусідо*. Прынцыпы Дз. (спантаннасць, натуральнасць, гармонія, прастата) паўплывалі на фарміраванне традыц. мастацтваў: каліграфіі, жывапісу, паэзіі, л-ры, музыкі, чайнай цырымоніі, кампазіцыі садоў і ландшафтаў, баявых мастацтваў і інш. Пік захаплення Дз. за межамі Японіі прыпадае на 1960-я г. і звязаны з маладзёжным рухам пратэсту. Манастыры і цэнтры па вывучэнні Дз. існуюць у ЗША, Англіі, Францыі, Германіі і інш. У Беларусі цікавасць да Дз. звязана найперш з распаўсюджаннем з 1970-х г. яп. баявых мастацтваў.

Літ.: Абаев Н.В. Чань-буддизм и культурно-психологические традиции в средневековом Китае. Новосибирск, 1989; Кацуки С Практика Дзэн. Железная флейта: (100 коанов Дзэна): Пер. с англ. Киев, 1993.

А.В.Гурко.

ДЗЭРЭ́НЫ (Procapra), род млекакормячых сям. пустарогіх атр. парнакапытных. 3 віды: Дз. мангольскі (P. gutturosa). Дз. Пржавальскага (P. przewalskii), Дз. тыбецкі (P. picticaudata). Пашыраны пераважна ў стэпах, паўпустынях, пустынях раўнін і гарах Цэнтр. Азіі. Трымаюцца статкамі.

Моцнага целаскладу, зграбныя. Даўж. цела 95—150 см, хваста 2—12 см, выш. ў холцы 54—95 см, маса 20—40 кг. У самцоў ліравалюбныя рогі (даўж. да 28 см). Колер жаўтавата-пясочны, на грудзях, хвасце і бруху белы. Кормяцца травяністымі раслінамі. Нараджаюць 1—2 дзіцянят. Хутка бегаюць (да 60—65 км/ гадз). Робяць сезонныя міграцыі. Аб'екты промыслу. Захаваліся пераважна ў нац. парках.

ДЗЮАМЕ́ЛЬ (Duhamel) Жорж (30.6.1884, Парыж — 13.4.1966), французскі пісьменнік. Чл. Франц. акадэміі (з 1935), яе старшыня (з 1960). Скончыў мед. ф-т Сарбоны (1908). Адзін з заснавальнікаў творчага аб'яднання «Абацтва» (1906), што дало пачатак унанімізму (літ. плынь франц. л-ры, прыхільнікі якой прапагандавалі ідэю калектыўнай аднадушнасці, злітнасці чалавека, у т.л. паэта, з масамі). Аўтар серыі раманаў «Жыццё і прыгоды Салавэна» (т. 1—5, 1920—32), «Хроніка сям'і Паск'е» (т. 1—10, 1933—44), зб-каў апавяданняў («Жыццё пакутнікаў», 1917, «Цывілізацыя», 1918, «Прыпавесці майго саду», 1936) і вершаў («Сябры», 1912, і інш.). Пісаў таксама п'есы, літ.-крытычныя даследаванні, мемуары. У творах аддаваў перавагу маральна-інтэлектуальным праблемам: асобы і цывілізацыі, небяспекі навук.-тэхн. прагрэсу і звязанай з ім дэгуманізацыі людзей.

Тв.: Рус. пер. — Гаврский нотариус; Наставники; Битва с тенями. М., 1974.

Е.А.Лявонава.

ДЗЮ́БА Уладзімір Іванавіч (н. 24.2.1946, г. Палтава, Украіна), бел. паэт і драматург. Скончыў БДУ (1968). Настаўнічаў, працаваў на тэлебачанні. З 1980 на Бел. радыё. Друкуецца з 1962. Аўтар зб-каў паэзіі «Вуліцы без назваў» (1972), «Кругазварот» (1976), «Карані бліскавіцы» (1986), вершаванай драмы «Доктар Русель» (1985, пра рэвалюцыянера-народніка М.Судзілоўскага), вершаваных драм. аповесцей «На Радзівілішчы» (1992), «Памінальная па Банапарту каля беларускага тракту» (1995), радыёп'ес у вершах «Жыццё рэвалюцыянера» (паст. 1987, з А.Пётухам), «Я, Арлоўскі» (паст. 1989), «Нарачным. Рукевічу. Рылееў» (паст. 1990). Распрацоўвае гіст. тэматыку.

Тв.: Доктар Русель: Драм. адысея. Мн., 1991.

ДЗЮБА́ЙЛА Павел Кузьміч (5.8.1931, в. Кукарава Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. — 24.1.1995), бел. крытык і літ.-знавец. Д-р філал. н. (1973), праф. (1982). Скончыў БДУ (1954). Настаўнічаў, з 1960 у Ін-це л-ры АН Беларусі. Друкаваўся з 1950. Даследаваў сучасную

Дзэрэн мангольскі.

бел. л-ру, асн. тэндэнцыі і заканамернасці развіцця рамана, стылявыя кірункі ў прозе. Адзін з аўтараў кніг «Праблемы сучаснай беларускай прозы» (1967), «Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць» (1971). Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1980 за ўдзел у 2-томным даследаванні «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і

П.К.**Дзюбайла**.

А.Ф.**Дзюбко**.

«Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» (1977, на рус. мове).

Тв.: Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне. Мн., 1964; Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе. Мн., 1973; Вобраз нашага сучасніка ў беларускай прозе. Мн., 1978; У вялікай дарозе. Мн., 1981; Беларускі раман: Гады 70-я. Мн., 1982; Панарама сучаснай беларускай прозы. Мн., 1986; У пошуках духоўных каштоўнасцей. Мн., 1987; Станоўчы герой у беларускай літаратуры: Сав. перыяд: Кн. для настаўніка. Мн., 1990.

ДЗЮ БЕЛЕ́ (Du Bellay) Жаашэн (1522, Лірэ, каля г. Шале, Францыя — 1.1.1560), французскі паэт. Адзін з кіраўнікоў літ. групы «Плеяда», у маніфесце якой «Абарона і праслаўленне французскай мовы» (1549) сфармуляваў шляхі абнаўлення франц. паэзіі — заснаванне новых жанраў, узбагачэнне моўных сродкаў, наследаванне ант. паэтам і інш. Аўтар зб. санетаў «Аліва» (1549—50) і зб. од «Лірычныя вершы» (1549). У 1553—57 жыў у Рыме, дзе стварыў свае лепшыя зб-кі санетаў «Старажытнасці Рыма» і «Шкадаванні», зб. од і элегій «Сельскія гульні» (усе апубл. 1558), якія перадаюць італьян. ўражанні паэта — яго адмоўнае стаўленне да каталіцкага Рыма, погляд на гісторыю развіцця чалавецтва, асуджэнне войнаў, туга па радзіме.

Тв.: Рус. пер. — у кн.: Поэзия Плеяды. М., 1984.

Літ.: Виппер Ю.Б. Поэзия Плеяды. М., 1976.

ДЗЮБКО́ Анатоль Фёдаравіч (н. 15.12.1923, в. Горваль Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Адэскае артыл. вучылішча (1942), Ваенна-артыл. камандную акадэмію (1954). У Вял. Айч. вайну з ліст. 1942 на Паўн.-Зах., 2-м Прыбалт., Ленінградскім франтах. Камандзір батарэі артыл. палка лейтэнант Дз. вызначыўся ў баях на тэр. Латвіі: 29.8.1944 у

час бою трапіў у акружэнне назіральны пункт батарэі і пях. батальён, дзе Дз. прыняў камандаванне на сябе, арганізаваў кругавую абарону, калі вораг прарваў яе, выклікаў на сябе агонь артылерыі, што дапамагло адбіць контратакі і ўтрымаць занятыя пазіцыі. Да 1976 у Сав. Арміі.

ДЗЮБУА́ (Dubois) Станіслаў (7.1.1901, Варшава — 21.8.1942), польскі паліт. дзеяч, журналіст. Чл. Польскай сацыяліст. партыі (з 1918). У 1919—21 удзельнічаў у *Сілезскіх паўстаннях*. Адзін з заснавальнікаў Саюза незалежнай сацыяліст. моладзі (1922). У 1928—30 дэпутат сейма. У 1929 адзін са стваральнікаў «Цэнтралеву» (блок 6 цэнтрысцкіх і левых партый). Быў арыштаваны і зняволены ў Брэсцкай крэпасці, у 1932 асуджаны на 3 гады. З 1934 прыхільнік саюзу сацыялістаў з камуністамі, у 1936—37 сузаснавальнік і нам. гал. рэдактара газ. «Dziennik Popularny» («Папулярны штодзённік»), якая выступала за адзіны фронт. У перыяд фаш. акупацыі чл. канспіратыўнай групоўкі «Барыкада свабоды». У 1940 арыштаваны гестапа, вывезены ў Асвенцім і расстраляны. *Н.К.Мазоўка.*

ДЗЮБУА́, Дзю Бойс (Dubois, Du Bois) Уільям Эдуард Бёркхарт (23.2.1868, г. Грэйт-Барынгтан, ЗША — 27.8.1963), амерыканскі гісторык, адзін з заснавальнікаў афра-амер. л-ры ЗША, грамадскі дзеяч. Вучыўся ва ун-це ў Фіска (1884—86), Гарвардскім (1886—92), Берлінскім (1892—94) ун-тах. Д-р філасофіі (1895), праф. эканомікі і гісторыі. Ганаровы д-р гіст. навук Маскоўскага ун-та (з 1959). Даследаваў барацьбу амер. неграў і народаў Афрыкі за раўнапраўе, супраць расавай дыскрымінацыі. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў руху «Ніягара» (1905), Асацыяцыі садзейнічання прагрэсу каляровага насельніцтва (1910—48), панафр. кангрэсаў (1919, 1921, 1923, 1927, 1945), чл. Сусв. Савета Міру (з 1950). З 1960 у Гане, дзе з 1962 кіраваў выданнем энцыклапедыі «Афрыка». Аўтар манаграфіі «Забарона гандлю рабамі» (1896), зб. нарысаў «Душы чорных людзей» (1903), трылогіі «Чорнае полымя» (1957—61) і інш.

ДЗЮБУА́ (Dubois) Эжэн (28.1.1858, г. Эйсдэн, Нідэрланды — 16.12.1940), галандскі антраполаг. Па адукацыі ваенны ўрач. У 1890—92 выявіў на в-ве Ява шкілетныя рэшткі выкапнёвага продка чалавека, назваўшы яго «Pithecanthropus erectus», г. зн. «малпачалавек прамастаячы». Гэтыя адкрыцці адыгралі важную ролю ва ўмацаванні эвалюцыйнай тэорыі.

ДЗЮБУА́-РЭЙМО́Н (Du Bois-Reymond) Эміль (7.11.1818, Берлін — 26.12.1896), нямецкі фізіёлаг і філосаф. Чл. Берлінскай АН (1851), замежны чл.-кар. Пецярбургскай АН (1892). Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1877). Праф. Берлінскага ун-та (1855). Навук. працы па жывёльнай электрычнасці: даказаў яе прысутнасць у мышцах, нервах, залозах, скуры, сятчатцы вока і інш. тканках, выявіў «ток спакою». Адкрыў фіз. электрон, распрацаваў індукцыйныя апараты для раздражнення нерваў і мышцаў, непалярызацыйныя электроды і інш. Як філосаф быў прыхільнікам механістычнага матэрыялізму, адмаўляў магчымасць пазнання свету, сутнасці рэчаў і дасягнення ісціны, выступаў супраць вучэння аб прысутнасці ў арганізмах нематэрыяльнай звышнатуральнай сілы.

ДЗЮВАЛЬЕ́ (Duvalier) Жан Клод (н. 3.7.1951, г. Порт-о-Прэнс, Гаіці), дзяржаўны і паліт. дзеяч Гаіці. У 1971—86 прэзідэнт Гаіці. Прэзідэнцкі пост паводле папраўкі да канстытуцыі (студз. 1971) атрымаў у спадчыну ад бацькі Ф.*Дзювалье*. Прадоўжыў умацаванне рэжыму жорсткай дыктатуры. Пры ім пагоршылася эканам. становішча Гаіці. Скінуты ў выніку нар. паўстання ў лют. 1986, эмігрыраваў у Францыю.

ДЗЮВАЛЬЕ́ (Duvalier) Франсуа (14.4.1907, г. Порт-о-Прэнс, Гаіці — 21.4.1971), дзяржаўны і паліт. дзеяч Гаіці. Скончыў мед. ф-т ун-та Гаіці (1932). У 1947—49 нам. міністра працы, у 1949—50 міністр працы і аховы здароўя. З 1957 лідэр Партыі нац. адзінства (з 1963 Адзіная партыя рэв. і ўрадавага дзеяння). З 1957 прэзідэнт Гаіці. У 1964 правёў праз Нац. сход канстытуцыю, паводле якой абвясціў сябе «пажыццёвым прэзідэнтам» і ўстанавіў крывавы рэжым дыктатуры, праводзіў палітыку рэпрэсій, праследаваў апазіцыю. Пост прэзідэнта перадаў сыну Ж.К.*Дзювалье*.

ДЗЮ ВІНЬЁ (du Vigneaud) Вінсент, гл. *Віньё* Вінсент дзю.

ДЗЮГО́НЬ (Dugong dugon), воднае млекакормячае сям. дзюгоневых атр. сірэн; адзіны від. Жыве ў Індыйскім і зах. ч. Ціхага ак. каля берагоў Усх. Афрыкі, Паўд. Азіі, а-воў Рукю, Маршалавых і Саламонавых. Зрэдку заходзіць у вусці рэк. Трымаецца па адным або парамі. Занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Дзюгонь.

Даўж. цела 2,5—3,2 м (да 5,8 у самцоў), маса да 170 кг. Тулава верацёнападобнае. Спіна зеленаватая, шаравата-бураватая або чарнаватая, бруха ружаватае або белаватае. Хваставы плаўнік двухлопасцевы, гарызантальны. Галава невял., маларухомая. У кожнай сківіцы 1 пара разцоў і 2 пары карэнных зубоў. У самцоў верхнія разцы ператварыліся ў біўні даўж. 20—25 см. Корміцца воднай расліннасцю. Нараджае 1 дзіцяня.

ДЗЮДО́ (ад яп. дзю мяккасць + до шлях), японская нац. барацьба (у кімано са свабодным поясам, без абутку). Пры барацьбе стоячы барцы імкнуцца з дапамогай падножак, падсечак, кідкоў і інш. прыёмаў кінуць адзін аднаго на татамі (спец. цыновачная мата), пры барацьбе лежачы — утрымаць праціўніка прыціснутым спіной да татамі або з дапамогай балевых прыёмаў і задушлівых захватаў прымусіць яго прызнаць сябе пераможаным. Схваткі праводзяцца ў 8 вагавых катэгорыях (жанчыны — 48, 52, 61, 66, 72, больш за 72 кг і абсалютная; мужчыны — 60, 65, 71, 78, 86, 95, больш за 95 кг і абсалютная) і працягваюцца 4 мін для жанчын і 5 мін для мужчын.

Дз. створана ў канцы 19 ст. праф. Д.Кано, які сістэматызаваў і палепшыў тэхніку *джыу-джыцу* (без элементаў, што пагражалі жыццю і здароўю барцоў) і ўвёў шмат новых, створаных ім самім. З канца 19 — пач. 20 ст. Дз. пашырылася ў шэрагу краін Еўропы, Азіі, Амерыкі. У 1956 створана Міжнар. федэрацыя Дз. Чэмпіянаты свету праводзяцца з 1956, чэмпіянаты Еўропы — з 1951. З 1964 Дз. — алімпійская дысцыпліна (перапынак у 1968).

На Беларусі развіваецца з 1974, у 1977 створана рэсп. федэрацыя. Сярод бел. дзюдаістаў чэмпіён Еўропы (1983, 1984, 1985), уладальнік Кубка свету (1984, 1986), бронзавы прызёр чэмпіяната свету (1985) В.Пясняк, чэмпіён Еўропы (1997) Р.Мамедаў, бронзавы прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы (1995) Н.Багіраў, прызёры чэмпіяната Еўропы 1977 А.Карыцкая і Т.Масквіна. Зборная каманда Беларусі сярэбраны прызёр Кубка Еўропы (1994).

ДЗЮК (Duke) Чарлз (н. 3.10.1935, г. Шарлат, штат Паўн. Караліна, ЗША), касманаўт ЗША. Скончыў Марскую акадэмію ЗША (1957), Масачусецкі тэхнал. ін-т (1964), школу па падрыхтоўцы пілотаў для аэракасм. даследаванняў (1965). У 1966—76 у групе касманаўтаў НАСА. 16—27.4.1972 з Дж.*Янгам* і Т.*Матынглі* здзейсніў палёт на Месяц як пілот месяцовай кабіны касм. карабля «Апалон-16». На Месяцы прабыў 71 гадз (3 выхады на яго паверхню агульнай працягласцю 20 гадз). Для перамяшчэння па месяцовай паверхні Дз. і Янг карысталіся месяцаходам. У космасе правёў 11 сут. Залаты медаль НАСА «За выдатныя заслугі».

ДЗЮКАМЕ́Н (Ducommun) Элі (19.2.1833, г. Жэнева, Швейцарыя — 7.12.1906), швейцарскі паліт. дзеяч,

публіцыст. Адзін з арганізатараў Міжнар. лігі міру і свабоды (1867). Ганаровы ген. сакратар Міжнар. бюро міру (з 1891). Аўтар шэрагу прац у абарону міру, у т.л. «Гістарычнага нарыса руху ў абарону міру» (1899). Нобелеўская прэмія міру 1902 (разам з А.*Габа*).

Ч.Дзюк.

Э.Дзюкамен.

ДЗЮ́КЕР (ням. Düker ад лац. duco вяду), напорны ўчастак *вадавода*, які пракладваюць пад рэчышчам ракі або канала, па дне глыбокай даліны або яра, пад дарогай і інш. перашкодамі для пропуску праз іх воднага патоку. Бываюць калодзежнага (шахтавага) тыпу і крывалінейныя, заглыбленыя і ўкладзеныя па паверхні, жалезабетонныя, бетонныя, стальныя і камбінаваныя. Часам маюць смеццезатрымальныя рашоткі, адстойнікі для акумуляцыі наносаў, затворы для аховы ад высокага ўзроўню вады пры рамонце і інш. Выкарыстоўваюцца ў сістэмах водазабеспячэння і каналізацыі, меліярацыі, гідратэхн. буд-ве і інш.

Жалезабетонны **дзюкер** пад каналам.

ДЗЮКЛО́ (Duclos) Жак (2.10.1896, г. Луэ, Францыя — 25.4.1975), палітычны дзеяч Францыі, дзеяч міжнар. камуніст. руху, журналіст. Удзельнік 1-й сусв. вайны. Чл. (з 1921) і адзін з кіраўнікоў (1926—64) Франц. камуніст. партыі (ФКП). Чл. Выканкома *Камуністычнага Інтэрнацыянала* (1935—43). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў франц. Руху Супраціўлення ў 2-ю сусв. вайну. Віцэ-старшыня Устаноўчага сходу (1945—46). Дэп. ніжняй палаты парламента (1926—32, 1936—39, 1946—58), сенатар (з 1959). Кандыдат у прэзідэнты Францыі ад ФКП на выбарах 1969. Быў сузаснавальнікам газ. «L'Humanité» («Чалавецтва») і дырэктарам газ. «Voix de l'Est» («Голас Усходу»). Аўтар мемуараў (т. 1—6, 1968—72), кніг «Будучыня дэмакратыі» (1962), «Бакунін і Маркс: цень і святло» (1974) і інш. *У.Я.Калаткоў.*

ДЗЮКЛО́ (Duclaux) П'ер Эміль (24.6.1840, г. Арыяк, Францыя — 3.5.1904), французскі мікрабіёлаг і хімік. Чл. Парыжскай АН (1888). Скончыў Вышэйшую нармальную школу ў Парыжы (1862). Працаваў з Л.*Пастэрам*. З 1895 дырэктар Пастэраўскага ін-та. Навук. працы па біяхіміі. Даследаваў хім. састаў малака, малочнакіслае браджэнне, уздзеянне сычужнага ферменту, састаў і ўтварэнне розных сыроў. Прапанаваў метад вызначэння лятучых кіслот шляхам фракцыйнай перагонкі. Вывучаў з'яву *осмасу* і руху вадкасці ў капілярах. Адстойваў мікробную тэорыю хвароб. Аўтар 4-томнага твора «Мікрабіялогія» (1898—1901).

ДЗЮЛЕ́Н (Dullin) Шарль (12.5.1885, г. Ен, Францыя — 12.12.1949), французскі рэжысёр, акцёр, педагог. У 1907—21 удзельнічаў у спектаклях парыжскіх т-раў пад кіраўніцтвам рэжысёраў А.Антуана, Ж.Капо, Ф.Жэм'е, Г.Баці і інш. У 1922 заснаваў у Парыжы т-р «Атэлье», дзе працаваў да 1940. У 1940-я г. акцёр і рэжысёр «Тэатра дэ Пары» і «Тэатра Сары Бернар» (Парыж), «Тэатра Селесцінцаў» (Ліён). Сярод пастановак: «Марыя Магдаліна» Ф.Гебеля (1912), «Асалода жыцця» Л.Піранд'эла (1922), «Вальпоне» Б.Джонсана (1928; і гал. роля). З лепшых акцёрскіх работ: Гарпагон («Скупы» Мальера), Смердзякоў («Браты Карамазавы» паводле Ф.Дастаеўскага). Выхаваў плеяду выдатных акцёраў і рэжысёраў франц. т-ра (Ж.Вілар, Ж.Баро, М.Марсо, Р.Руло і інш.). Аўтар кн. «Успаміны і нататкі акцёра» (1946).

ДЗЮЛЁРАН (Dulaurans) Нестар (каля 1825, Варшава — 1868), удзельнік паўстання 1863—64. Каля 1861 працаваў у кіраўніцтве буд-вам Варшаўска-Пецярбургскай чыгункі ў Вільні, удзельнічаў у арг-цыі першых рэв. гурткоў. Балансаваў паміж «*чырвонымі*» і «*белымі*». У 1862 камісар Варшаўскага Цэнтр. нац. к-та ў *Літоўскім правінцыяльным камітэце*, неўзабаве выключаны з к-та, зблакіраваўся з «белымі». У лют. 1863 выступіў з прапановай адхіліць «чырвоных» ад кіраўніцтва паўстаннем. Па яго ініцыятыве Літоўскі к-т распушчаны і створаны «белы» *Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы*, у якім Дз. заняў пасаду камісара варшаўскага паўстанцкага ўрада ў Літве і Беларусі. З лета 1863 у Познані — пам. рэв. камісара ў Прусіі, з лета 1864 у Дрэздэне — рэв. камісар паўстанцкага ўрада ў Германіі. Пасля задушэння паўстання эмігрыраваў у Парыж. *В.Ф.Шалькевіч.*

ДЗЮМА́ (Dumas) Аляксандр, Дзюма-бацька (Dumas père; 24.7.1802, г. Вілер-Катрэ, Францыя — 5.12.1870), французскі пісьменнік. Сын рэсп. генерала. Дэбютаваў вадэвілем «Паляванне і каханне» (1825). Вядомасць Дз. прынеслі рамант. драма «Генрых III і яго двор» (1829), п'есы «Антоні» (1831), «Нельская вежа» (1832), «Кін» (1836). У 1835 апублікаваў першы гіст. раман «Ізабэла Баварская». Творчы росквіт прыпадае на 1840-я г., калі былі выдадзены яго вядомыя гіст.-авантурныя раманы: трылогія «Тры мушкецёры» (1844), «Праз дваццаць гадоў» (1845), «Віконт дэ Бражэлон» (т. 1—3, асобнае выд. 1848—50); трылогія пра Генрыха Наварскага «Каралева Марго» (1845), «Пані Мансаро» (асобнае выд. 1846), «Сорак пяць» (асобнае выд. 1847—48); «Граф Монтэ-Крыста» (асобнае выд. 1845—46). Абапіраючыся на вял. гіст. матэрыял, Дз. цікава і дынамічна ўзнаўляе быт і норавы эпохі, характары гіст. асоб. Аднак яго раманы не вызначаюцца глыбокім гіст. і псіхал. аналізам, значныя гіст. падзеі часта тлумачацца выпадковым збегам абставін, што стварае эфектныя сітуацыі і заблытаныя інтрыгі. Літ. спадчына Дз. ўключае таксама кн. «Мае мемуары» (т. 1—22, 1852—54), пуцявыя нататкі (у т.л. «З Парыжа ў Астрахань», т. 1—5, 1858), творы самых розных жанраў.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—12. М., 1976—80.

Літ.: Моруа А. Три Дюма: Пер. с фр. Мн., 1982. *І.С.Александровіч.*

ДЗЮМА́ (Dumas) Аляксандр, Дзюма-сын (Dumas fils; 28.7.1824, Парыж — 27.11.1895), французскі пісьменнік. Чл. Франц. акадэміі (з 1874). Пазашлюбны сын А.*Дзюма*. Дэбютаваў зб. вершаў «Грахі юнацтва» (1847). Аўтар раманаў «Дама з камеліямі» (т. 1—2, 1848; прататыпам гал. гераіні паслужыла франц. актрыса Мары Дзюплесі), «Доктар Серван» (т. 1—2, 1849), «Тры моцныя мужчыны» (т. 1—4, 1850) і інш. Вядомасць прынесла драма «Дама з камеліямі» (паводле аднайм. рамана, паст. 1852; на яе сюжэт нап. опера Дж.Вердзі «Травіята»). У інш. п'есах, што суправаджаў у друку вял. тэарэт. прадмовамі, сцвярджаў непахіснасць асноў сям'і і грамадства; быў прыхільнікам разводу, выступаў у абарону правоў пазашлюбных дзяцей, патрабаваў павагі да жанчыны ў сям'і (п'есы «Паўсвет», 1855, «Незаконны сын», 1858, «Жонка Клода», 1873, «Чужаземка», 1876, і інш.).

Літ.: Моруа А. Три Дюма: Пер. с фр. Мн., 1982. *І.С.Александровіч.*

ДЗЮМЕНІ́ЛЬ [Dumesnil; сапр. Маршан (Marchand) Мары Франсуаз; 2.1.1713, Парыж — 20.2.1802], французская актрыса. Сцэн. дзейнасць пачала ў правінцыі. У 1737—76 выступала ў т-ры «Камеды Франсэз» (Парыж). Актрыса стыхійнага тэмпераменту, натхнення, інтуіцыі; выконвала трагедыйныя ролі ў класіцыстскай драматургіі Вальтэра, П.Карнеля, Ж.Расіна. Яе мастацтва адыграла значную ролю ў падрыхтоўцы асветніцкай рэформы франц. т-ра.

ДЗЮМО́Н-ДЗЮРВІ́ЛЬ (Dumont d'Urville) Жуль Себасцьен Сезар (23.5.1790, г. Кандэ-сюр-Нуаро, Францыя — 8.5.1842), французскі мараплавец і акіянограф. У 1826—28 здзейсніў

кругасветнае плаванне на караблі «Астралябія», у час якога знайшоў сляды загінуўшай экспедыцыі Ж.*Лаперуза*, даследаваў некалькі астраўных груп у Ціхім ак., нанёс на карту частку берагоў Новай Зеландыі і Новай Гвінеі. У 1837—40 ажыццявіў плаванне ў Антарктыку на суднах «Астралябія» і «Зеле»; адкрыў Зямлю Луі Філіпа, в-аў Жуанвіль, Зямлю Адэлі. У яго гонар названа *Дзюрвіля мора* ў Антарктыцы.

А.Дзюнан.

ДЗЮНА́Н (Dunant) Анры Жан (8.5.1828, г. Жэнева, Швейцарыя — 30.10.1910), швейцарскі паліт. дзеяч, гуманіст, заснавальнік *Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа*. Аўтар кн. «Успамін пра Сальферына» (1862, пра падзеі аўстра-італа-франц. вайны 1859), у якой абгрунтаваў ідэю стварэння міжнар. арг-цыі па дапамозе ахвярам вайны, чым значна паўплываў на заключэнне Жэнеўскай канвенцыі 1864. Нобелеўская прэмія міру 1901 (разам з Ф.*Пасі*).

ДЗЮНКЕ́РКСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1940 (кодавая назва «Дынама»), марская эвакуацыя саюзных (брыт. экспедыцыйных, часткі франц. і бельг.) войск з раёна г. Дзюнкерк (Францыя) у Вялікабрытанію 26.5—4.6.1940 у 2-ю сусв. вайну. Праведзена пасля прарыву ням.-фаш. танк. злучэнняў да ўзбярэжжа Ла-Манша каля г. Абвіль (20 мая), у выніку чаго ў Паўн. Францыі і Бельгіі пад пагрозай знішчэння апынуліся 18 франц., 12 бельг., 10 брыт. дывізій, якія не здолелі злучыцца з асн. сіламі франц. арміі (знаходзіліся на Пд ад р. Сома). Пад націскам 43 герм. дывізій саюзныя войскі адышлі да Дзюнкерка і стварылі вакол яго абарончы плацдарм. 26 мая пачалася эвакуацыя брыт. экспедыцыйных сіл, а 28 мая (пасля капітуляцыі Бельгіі) — саюзных франц. і бельг. войск. Эвакуацыю прыкрывалі брыт. ВПС і саюзная зенітная артылерыя. Усяго 26 мая — 4 чэрв. на 860 розных (пераважна брыт.) суднах вывезена 278,8 тыс. чал. (з іх 139,8 тыс. англічан, 139 тыс. французаў і бельгійцаў), а з улікам вывезеных перад апераціяй 59,3 тыс. англічан — больш за 338 тыс. чал. У Дз. а. англічане страцілі 68 тыс. чал., 302 самалёты, 224 караблі, французы — каля 60 суднаў, 40 тыс. чал. палоннымі і інш.; на беразе засталася баявая тэхніка саюзнікаў.

Літ.: Черчилль У. Вторая мировая война: Пер. с англ. М., 1991. Кн. 1, т. 2. С. 333—357.

ДЗЮ́НЫ (ням. Düne, адз. л.), выдмы, формы рэльефу пяскоў, утвораныя ветравой акумуляцыяй. Трапляюцца на ўзбярэжжах мораў, азёр, на рачных тэрасах, зандравых раўнінах, напр., на ўзбярэжжах Балтыйскага, Белага, Аральскага, Каспійскага мораў, на берагах Балхаша і інш. У адрозненне ад *барханаў* «рогі» Дз. накіраваны супраць ветру. Наветраны схіл доўгі і спуцісты, падветраны — стромкі і пукаты. Выш. да 30 м, зрэдку да 100 м. Не замацаваныя расліннасцю Дз. могуць перамяшчацца ў напрамку пануючых вятроў са скорасцю 1—20 м за год. Адрозніваюць папярочныя, падоўжаныя і парабалічныя Дз. На Беларусі стараж. Дз. трапляюцца на Палессі, Полацкай, Нарачана-Вілейскай і Нёманскай нізінах.

ДЗЮПІНЭ́ (Dupiney) Вінсент, французскі мастак-картаньер 18 ст. Нарадзіўся ў г. Ліёне (Францыя). Працаваў на ткацкіх прадпрыемствах Ліёна і Берліна. Выраблял «узорнікі» для тканых паясоў. З 1768 ткач *Гродзенскіх каралеўскіх мануфактур*, дзе на «французскі манер» арганізаваў вытворчасць узорыстых тканін і паясоў (кіраўнік мануфактуры да 1780, у 1770—77 з Ж.Л.Унардам). Пры ім за першыя 2 гады колькасць варштатаў мануфактуры павялічылася з 6 да 60. Яму належыць шэраг паясоў з дэкорам па канцах у выглядзе 2 дрэў, паміж якімі кошык з кветкамі, над імі вянок, знізу ягня; таксама прыпісваюцца тканіны ў палосы з рэдкімі і дробнымі кветкавымі бутаньеркамі.

Літ.: Pasy kontuszowe z polskich manufaktur i pracowni w zbiorach Muzeum Narodowego w Warszawie. Warszawa, 1995. *І.М.Каранеўская.*

Пясчаная **дзюна** на ўзбярэжжы Прыбалтыкі.

Да арт. **Дзюнкеркская аперацыя 1940**. Набярэжная ў Дзюнкерку пасля эвакуацыі брытанскіх, французскіх і бельгійскіх войск.

ДЗЮПО́Н ДЭ НЕМУ́Р (Duponts de Nemours) П'ер Самюэль (14.12.1739, Парыж — 7.8.1817), французскі эканаміст і паліт. дзеяч. Прадстаўнік школы *фізіякратаў* (увёў гэты тэрмін). Вучань і супрацоўнік Ф.*Кенэ*, дарадчык А.Р.Ж. *Цюрго* і яго паслядоўнікаў. У 1767 апублікаваў працу «Аб узнікненні і развіцці новай навукі», у якой даў найб. поўны сістэм. выклад вучэння фізіякратаў. У 1780 ініцыраваў правядзенне ў Францыі фін. рэформ. У 1789 абраны ў Нац. сход. Прыхільнік усеагульнай асветы, распрацаваў шэраг адукац. праектаў, заснаваных на вучэнні фізіякратаў, у т.л. для Цюрго ў Францыі (1775) і Т.*Джэферсана* ў ЗША (1800), а таксама для *Адукацыйнай камісіі* ў Рэчы Паспалітай (у 1774 кароткі час быў яе сакратаром). У сваіх працах адзначаў узорны характар асв. рэформы ў Рэчы Паспалітай. У 1814 эмігрыраваў у ЗША.

Н.К.Мазоўка.

«ДЗЮПО́Н ДЭ НЕМУ́Р ЭНД КО́МПАНІ» (E.I. Du Pont de Nemours and Company), буйнейшы ў свеце хімічны і па выт-сці зброі канцэрн ЗША. Узнік на аснове невял. парахавога завода, заснаванага ў 1802 франц. эмігран-

там Э.І.Дзюпонам дэ Немурам. У 1899 адбылося аб'яднанне ўсіх прадпрыемстваў, якія належалі сям'і Дзюпон. Да 1-й сусв. вайны канцэрн вырабляў выключна выбуховыя матэрыялы і неарган. сыравіну, у час вайны гал. пастаўшчык выбуховых матэрыялаў у краіны Антанты, апрача таго развіваў выт-сць фарбавальнікаў і штучнага шоўку. Пасля вайны канцэрн устанавіў свой кантроль над большасцю прадпрыемстваў хім. прам-сці ў ЗША. У 1938—39 пачаў выт-сць першага поліаміднага валакна — нейлону. З 1942 вырабляе кампаненты для ядзернай зброі і ядзерных рэактараў. Звязаны фінансава з групай Моргана, а таксама з брыт. канцэрнам «Імперыял кемікал індастрыс» і бельг. канцэрнам «Сальвэ». Робіць значны ўплыў на палітыку ўрада ЗША.

Н.К.Мазоўка.

ДЗЮПО́НЫ (Du Pont), сямейная фін. і прамысл. група ў ЗША. Заснавальнік — Э.І.Дзюпон дэ Немур (1771—1834), сын П.С.*Дзюпона дэ Немура*. У 1802 ён пабудаваў у пас. Уілмінгтан (штат Дэлавэр) парахавы з-д. Разбагацелі на ваен. бізнесе ў час англа-амер. вайны 1812—14, амер.-мекс. вайны 1846—48, грамадз. вайны ў ЗША 1861—65, 1-й і 2-й сусв. войнаў. Пры Т.К.Дзюпоне (1863—1930) узнік хім. канцэрн *«Дзюпон дэ Немур энд компані»* (1899).

ДЗЮПРЭ́ (Dupré) Жуль (5.4.1811, г. Нант, Францыя — 6.10.1889), французскі жывапісец, адзін з вядучых пейзажыстаў *барбізонскай школы*. Працаваў у Парыжы і Л'Іль-Адане. Для яго творчасці характэрны эмацыянальная, рамант. трактоўка драм. з'яў прыроды, цяга да гучнасці і насычанасці колеравага тону, кантрастаў святла і ценю («Вялікі дуб», 1844—45, «Дубы ля дарогі», 1850-я г., «Марскі адліў у Нарманды», каля 1870), уключэнне ў пейзаж жанравых матываў («Пейзаж з каровамі», 1850-я г.).

ДЗЮПРЭ́ (Dupré) Луі (каля 1697 — кастр. 1774), французскі танцоўшчык, балетмайстар, педагог; адзін з заснавальнікаў мужчынскага сцэн. танца. Вучыўся ў школе пры «Каралеўскай акадэміі музыкі і танца» ў Парыжы («Гранд-Апера»), у 1715—22 і 1730—51 саліст гэтага т-ра. У 1722—30 працаваў у Варшаве, гастраліраваў у Лондане, Дрэздэне, Вене. Танцаваў у лірычных трагедыях, балетах, операх-балетах, а таксама чаконы і пасакаллі. Яго танец вылучаўся грацыёзнасцю, пластычнасцю, высакароднай манерай выканання. У 1756 запрошаны Г.Ф.Радзівілам у прыдворны т-р у Слуцку, разам з А.*Дуціні*. Дз. — стваральнік мясц. балета. У 1756—58 выкладаў у Слуцкай балетнай школе, выступаў у Слуцку і ў Белым (Бяла-Падляска, Польшча). У 1758 пераехаў у Нясвіж, дзе паводле дагавору з М.К.Радзівілам Рыбанькай павінен быў да 1761 выступаць на сцэне, пісаць лібрэта і ставіць балеты, падрыхтаваць для т-ра 8 дзяцей і вучыць танцам усіх, каго яму дадуць. Сярод яго вучняў Ж.Ж.*Навер*, Г.Вестрыс, М.Гардэль. *Г.І.Барышаў.*

ДЗЮР Мікалай Восіпавіч (17.12.1807, С.-Пецярбург — 28.5.1839), рускі акцёр. Выхаванец Пецярбургскага тэатр. вучылішча (1816—29). У 1829 прыняты ў Пецярбургскі т-р. Спачатку выконваў невял. ролі ў трагедыях, меладрамах, операх (партыі барытона). З 1831 выступаў пераважна ў вадэвілях. Жывасць і прастата ігры, прыгожы голас, уменне танцаваць і свабодна трымацца на сцэне прынеслі яму асаблівы поспех у ролях «свецкіх ветрагонаў» і «камічных старых»: Фрэйтаг, Макар Губкін («Дзяўчына-гусар», «Студэнт, артыст, харыст і аферыст» Ф.Коні), Жавіяль («Страпчы пад сталом» Дз.Ленскага) і інш. Першы выканаўца ролі Хлестакова («Рэвізор» М.Гогаля).

ДЗЮРА́ЛЬ, дзюралюміній (ад назвы ням. г. Дзюрэн, дзе распачалі прамысл. вытв-сць сплаву + *алюміній*), гл. *Дуралюмін*.

ДЗЮРА́НС (Durance), рака на ПдУ Францыі, левы прыток Роны. Даўж. 350 км, пл. бас. 14,2 тыс. км^2. Пачынаецца

Ж.Дзюпрэ. Дубы ля дарогі. 1850-я г.

ў Коцкіх Альпах, перасякае адгор'і Праванскіх Альпаў, у нізоўі цячэ па Ронскай нізіне. Сярэдні расход вады 190 м^3/с. Жыўленне ў вярхоўі снегавое, на астатнім працягу — дажджавое. Вясна-летнія высокія паводкі; бываюць навадненні. Каскад ГЭС. Выкарыстоўваецца для арашэння. У вусці — г. Авіньён.

ДЗЮРВІ́ЛЯ МО́РА (d' Urville Sea), ускраіннае мора Індыйскага ак., каля берагоў Антарктыды. Абмывае Зямлю Адэлі. Паўд. ч. мора знаходзіцца ў межах мацерыковай водмелі (глыб. каля 500 м), паўночная — мацерыковага схіла (глыб. да 3610 м). Дрэйфучыя ільды; шмат айсбергаў. Салёнасць каля 34 ‰. Адкрыта ў 1914 аўстрал. антарктычнай экспедыцыяй пад кіраўніцтвам Д.Моўсана. Названа ў гонар франц. мараплаўца Ж.*Дзюмон-Дзюрвіля*.

ДЗЮРКГЕ́ЙМ (Durkheim) Эміль (15.4.1858, г. Эпіналь, Францыя — 15.11.1917), французскі філосаф і сацыёлаг, заснавальнік франц. сацыялагічнай школы. Праф. сацыялогіі і педагогікі ў Бардо (з 1896) і Сарбоне (з 1902). Грамадства разглядаў як асобую рэальнасць, аснову якой складаюць сац. факты, якія існуюць незалежна ад індывідаў і здольныя аказваць на іх прымусовы націск. Сац. факты Дз. падзяляў на марфалагічныя (складаюць матэрыяльны субстрат грамадства — шчыльнасць насельніцтва, развіццё шляхоў зносін і інш.) і духоўныя (утвараюць у сукупнасці калектыўную або агульную свядомасць). Кожнае грамадства мае розную ступень сац. салідарнасці, згуртаванасці. Грамадскае развіццё — пераход ад «механічнай» салідарнасці, заснаванай на падабенстве індывідаў і функцый, якія яны выконваюць, да «арганічнай», якая грунтуецца на падзеле працы. Антыпод сац. салідарнасці — *анамія*. Сацыялогія Дз. — першы разгорнуты варыянт структурна-функцыян. падыходу пры вывучэнні грамадства, які атрымаў класічнае адлюстраванне ў працах Т.Парсанса і Р.Мертана.

Тв.: Рус. пер. — О разделении общественного труда: Метод социологии. М., 1990; Самоубийство: Социол. этюд. М., 1994.

А.У.Рубанаў.

ДЗЮРО́К, парода свіней мяснога кірунку. Выведзена ў 1860 у ЗША, дзе і цяпер найб. пашырана. На Беларусі гадуюць на племянной ферме ў Гродзенскім р-не з 1987. Выкарыстоўваюць у прамысл. скрыжаванні і пры стварэнні спец. мясных ліній.

Жывёлы з шырокімі і глыбокімі грудзямі, доўгім тулавам, аркападобнай спіной і звіслым крыжам, з вял. кумпякамі. Масць ад цёмна- да светла-чырвонай і залаціста-рыжая. Жывая маса дарослых кныроў да 277, матак 245 кг, даўж. тулава адпаведна 171 і 162 см. Пладавітасць 9—10 парасят за апарос.

ДЗЮ́РЫНГ (Dühring) Яўген (12.1.1833, Берлін — 21.9.1921), нямецкі філосаф, эканаміст, праваед. Прыват-дацэнт Берлінскага ун-та (1863—77). Імкнуўся стварыць філас. сістэму абсалютных ведаў, якая грунтавалася на апрыёрных, аксіялагічных прынцыпах; яе тэарэт. аснова — *кантыянства*, *пазітывізм*, *вульгарны матэрыялізм*. Сусвет разглядаў як бясконцы, але які мае пачатак у часе, адмаўляўся пры гэтым ад прызнання боскага першаштуршка і дапускаў спрадвечнае адзінства матэрыі і мех. сілы. Законы дыялектыкі, паводле Дз., — лагічныя канструкцыі, што звонку накладваюцца на з'явы. У тэорыі пазнання проціпастаўляў ісціну і памылковы погляд, адхіляў дыялектыку адноснай і абс. ісціны. У сацыялогіі прытрымліваўся канцэпцыі «рабінзанады» — прызнаваў існаванне ізаляваных індывідаў, а ў аснову фарміравання адносін паміж імі паклаў «тэорыю насілля». Насілле лічыў прычынай сац. няроўнасці і галечы, быў праціўнікам рэв. пераваротаў у грамадстве, спрабаваў тэарэтычна абгрунтаваць ідэю паступовых сац. пераўтварэнняў на карысць чалавека. Аўтар прац «Крытычная гісторыя ўсеагульных прынцыпаў механікі»

(1873), «Курс філасофіі» (1875), «Курс нацыянальнай і сацыяльнай эканомікі» (1876), «Логіка і тэорыя пазнання» (1878) і інш. Ідэі Дз. супрацьстаялі вучэнню К.Маркса; крытычную ацэнку ім даў Ф.Энгельс у працы «Анты-Дзюрынг» (1877—78).

Тв.: Рус. пер. — Курс национальной и социальной экономики... СПб., 1893; Ценность жизни... СПб., 1894; Великие люди в литературе: Критика современной лит. с новой точки зрения. СПб., 1897; Социальное спасение — в действительном праве. СПб., 1909.

Т.І.Адула.

ДЗЮ́РЭНМАТ (Dürrenmatt) Фрыдрых (5.1.1921, г. Кональфінген, Швейцарыя — 14.12.1990), швейцарскі пісьменнік. Пісаў на ням. мове. Вывучаў філалогію, філасофію і прыродазнаўчыя навукі ва ун-тах Берна і Цюрыха. Дэбютаваў п'есай «Пісанне гаворыць» (1947). Сусветную вядомасць яму прынеслі п'есы «Візіт старой дамы» (1956), «Фізікі» (1962), «Скрыжаванцы» (1967). У прозе вылучаюцца зб. апавяданняў «Горад» (1952), аповесць «Аварыя» (1956), раманы «Суддзя і яго кат» (1950—51), «Абяцанне» (1958). У творах Дз. спалучаюцца абсурд і парадокс, гратэск і ўмоўнасць, камічнае і трагічнае, выкарыстоўваецца дэтэктыўны элемент. Яго п'есы ставіліся ў Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі («Іграем Стрындберга», 1983, «Фізікі», 1985, «Метэор», 1989), Нац. т-ры імя Я.Купалы («Ромул Вялікі», 1996). Па матывах п'есы «Візіт старой дамы» С.Картэс напісаў оперу «Візіт дамы» (паст. ў Нац. т-ры оперы Беларусі ў 1995).

Тв.: Рус. пер. — Избранное. [Т. 1—2]. Киев, 1995.

Літ.: Павлова Н.С. Ф.Дюрренматт. М., 1967.

Е.А.Лявонава.

ДЗЮ́РЭР (Dürer) Альбрэхт (21.5.1471, г. Нюрнберг, Германія — 6.4.1528), нямецкі жывапісец, рысавальшчык, гравёр, тэарэтык мастацтва. Заснавальнік мастацтва ням. Адраджэння. Вучыўся ювелірнай справе ў свайго бацькі, у 1486—89 — жывапісу ў майстэрні М.Вольгемута ў Нюрнбергу, дзе ўспрыняў прынцыпы ням. і нідэрл. позняй готыкі і азнаёміўся з некат. творамі ранняга італьян. Адраджэння. Праілюстраваў у 1488—90 шэраг нюрнбергскіх, у 1491—92 базельскіх выданняў. У 1490—94 выканаў у познагатычным стылі некалькі станковых гравюр, ілюстраваў кнігу «Карабель дурняў» С.Бранта і інш. Пасля першай (1494—95) і другой (1505—07) паездак у Італію актыўна развіваў маст. прынцыпы Адраджэння. У жывапісе Дз. ўмацоўваюцца дакладнасць вобразнай структуры, імкненне да строга ўпарадкаванага размяшчэння пластычных аб'ёмаў у прасторы, да супастаўлення лакальных колераў (шматфігурныя кампазіцыі «Дрэздэнскі алтар», каля 1496, «Алтар Паўмгартнераў», 1502—04, «Пакланенне Тройцы», 1511). У партрэтах і аўтапартрэтах сцвярджаў новае рэнесансавае разуменне чалавечай асобы і сац. стану мастака («Аўтапартрэт», 1498). Стварыў тып чалавека рэнесансавай эпохі, прасякнутага гордай самасвядомасцю ўласнай асобы, напружанай духоўнай энергіяй і практычнай мэтанакіраванасцю (партрэты: маладога чалавека, 1521, Х.Гольцшуэра, 1526, і інш.). Дасканала вывучаў прапорцыі чалавечага цела («Адам і Ева», 1507). Выканаў шэраг малюнкаў, але найб. ўвагу аддаваў гравюры (каля 350 малюнкаў для дрэварытаў і каля 100 медзярытаў). У серыі дрэварытаў «Апакаліпсіс» (1498), цыклах «Вялікія страсці» (каля 1497—1511), «Жыццё Марыі» (каля 1502—11), «Малыя страсці» (1509—11) адлюстраваў гуманіст. ўяўленні пра сэнс быцця і задачы мастацтва. Вытанчаная распрацоўка суадносін святла і паветранай прасторы, надзвычайная дакладнасць графічнай мовы, якасць ліній і аб'ёму ўласцівы тром т. зв. «майстарскім» медзярытам: «Рыцар, смерць і д'ябал» (1513) — вобраз непахіснага выканання свайго абавязку, стойкасці перад любымі выпрабаваннямі лёсу; «Меланхолія» (1514) — увасабленне ўнутраных канфліктаў і пошукаў неспакойнага творчага духу; «Іеранім у келлі» (1514) — ухваленне гуманіст. даследчай думкі. Стварыў і жыццёва-непасрэдныя нар. вобразы («Сяляне танцуюць», 1514). Аўтар трактатаў «Кіраўніцтва да вымярэння цыркулем і лінейкай» (1525), «Кіраўніцтва па ўмацаванні гарадоў, замкаў і крэпасцей» (1527), «Чатыры кнігі аб прапорцыях чалавека» (1528). Маст. пошукі Дз. завяршыў твор «Чатыры апосталы» (1526), дзе ўвасоблены 4 характары-тэмпераменты людзей, звязаныя з агульным гуманіст. ідэалам незалежнай думкі, сілы волі, стойкасці ў барацьбе за справядлівасць і ісціну.

Літ.: Либман М.Я. Дюрер и его эпоха. М., 1972; Львов С.П. А.Дюрер. М., 1977; Нессельштраус Ц.Г. Альбрехт Дюрер. Л.; М., 1961.

А.Дзюрэр. Аўтапартрэт. 1498.

А.Дзюрэр. Меланхолія. Гравюра разцом на медзі. 1514.

ДЗЮС, мегалітычная грабніца фінальнай стадыі дацкага ранняга неаліту (культура лейкападобных кубкаў) у выглядзе каменнай скрыні з тонкіх пліт (цыста), перакрытага камянямі. Змяшчала 1—6 шкілетаў. Пахавальная камера перакрыта насыпам, абкладзеным у аснове камянямі. Падобныя цысты меншых памераў будавалі інш. групы культуры лейкападобных кубкаў у Паўн. Еўропе.

ДЗЮ́СЕЛЬДОРФ (Düsseldorf), горад на З Германіі, на ніжнім Рэйне. Адм. ц. зямлі Паўн. Рэйн-Вестфалія. 574,9 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Порт на р. Рэйн. Міжнар. аэрапорт. Важны індустр. цэнтр Рурскага прамысл. раёна, адзін з буйнейшых фінансава-эканам. цэнтраў краіны. Прам-сць: чорная металургія (вытв-сць сталі, пракату, труб, стальных канструкцый), машынабудаванне (рознае прамысл. абсталяванне, с.-г. машыны, станкі, вагона-, аўтабудаванне, эл.-тэхн.), хім., алюмініевая, нафтаперапр., электронная, швейная, шкляная, папяровая, паліграф., харчовая. Цэнтр ням. моды. Міжнар. кірмашы. Ун-т. Маст. музей (жывапіс, графіка, скульптура), музей Кунстгале (мастацтва 20 ст.) і інш. Радзіма Г.Гейне (музей). Замак, цэрквы, ратуша і інш. арх. помнікі 13—18 ст.

Упершыню згадваецца каля сярэдзіны 12 ст. як паселішча. З 1190 уладанне графаў Берга (з канца 15 ст. іх пастаянная рэзідэнцыя). З 1288 горад. З 1609, канчаткова з 1614, уладанне князёў Пфальца, іх рэзідэнцыя ў 1614—1716. У час напалеонаўскіх войнаў пад баварскім (1801—06), потым франц. кіраваннем. З 1815 у складзе Прусіі. З сярэдзіны 19 ст. горад значна вырас у сувязі з прамысл. развіццём Рэйнскай вобл. У 2-ю сусв. вайну стары горад моцна разбураны, пасля вайны часткова адноўлены. З 1949 адм. ц. зямлі Паўн. Рэйн-Вестфалія.

ДЗЮСЕЛЬДО́РФСКАЯ ШКО́ЛА ЖЫВАПІСУ, адна са школ ням. жывапісу 19 ст. Узнікла ў сувязі з заснаваннем у 1819 Дзюсельдорфскай АМ, першы дырэктар якой П.*Карнеліус* імкнуўся скіраваць яе дзейнасць у рэчышча акадэмізаванага *рамантызму*. Пры дырэктару В.Шадаве (1826—59) у ёй вылучыліся асобныя кірункі: нац.-гіст. тэматыка трактавалася ў павярхоўна-рамант. (К.Ф.Зон, Т.Гільдэбрант), эпіка-гераічным (А.Рэтэль) і нават апазіцыйна антыкаталіцкім (К.Ф.Лесінг) рэчышчы; развіваўся рэаліст. пейзаж (О. і А.Ахенбах). У быт. жанры з 1850-х г. панавалі ідылічныя сцэны з бюргерскага і традыц. сялянскага побыту (Л.Кнаўс, Б.Вацье).

ДЗЮСЕРСО́ (Du Cerceau, Ducerceau), сям'я французскіх архітэктараў 16—17 ст. Жак І Андруэ (1510 ці 1512, Парыж — каля 1585), у 1531—33 працаваў у Італіі. Вядомасць прынеслі цыклы дакументальна дакладных афортаў з выявамі помнікаў архітэктуры: «Кніга архітэктуры» (1559—61), «Антычныя аркі і манументы» (1560), «Найпрыгажэйшыя будынкі Францыі» (т. 1—2, 1576—79). У сваіх праектах (святочна-парадныя замкі Шарлеваль у Нармандыі, Вернёй-сюр-Уаз у Іль-дэ-Франсе) свабодна спалучаў элементы ант. і рэнесансавай італьян. архітэктуры. Жак ІІ Андруэ (каля 1550—1614), з 1588 «архітэктар караля». Удзельнічаў у буд-ве Вял. галерэі Луўра і павільёна Флоры палаца Цюільры ў Парыжы (1600—08, не захаваўся).



Жак І Андруэ **Дзюсерсо**. Замак-палац Вернёй-сюр-Уаз. З афорта цыкла «Найпрыгажэйшыя будынкі Францыі». 1576.

ДЗЮФА́І (Dufay) Гіём (каля 1400, г. Камбрэ, Францыя — 27.11.1474), нідэрландскі кампазітар; адзін з заснавальнікаў *нідэрландскай школы*. Выхоўваўся і вучыўся музыцы ў метрызе (царк. школе) пры кафедральным саборы ў Камбрэ. З 1420 у Італіі. Спяваў у папскай капэле ў Рыме (1428—33 і 1435—37) і інш. У 1437—39 служыў пры двары герцага Савойскага. З 1439 (з перапынкамі) канонік і муз. кіраўнік у саборы ў Камбрэ. Прадстаўнік строгага поліфанічнага стылю. Распрацаваў гал. жанр нідэрл. поліфаніі — 4-галосую месу (збераглiся поўнасцю 9 мес і шмат іх асобных частак). Шырока выкарыстоўваў муз. формы, заснаваныя на cantus firmus, а таксама тэхніку меладычнага вар'іравання. Аўтар матэтаў, песень і інш. Яго дзейнасць значна паўплывала на далейшае развіццё нідэрл. поліфанічнай школы.

ДЗЮФІ (Dufy) Рауль (3.6.1877, г. Гаўр, Францыя — 23.3.1953), французскі жывапісец, графік, тэатр. мастак. У 1900—01 вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы. Зазнаў уплыў *імпрэсіянізму*, у 1905—08 прымыкаў да *фавізму*. Вывучаў нар. лубок, у стылі якога выканаў шматлікія гравюры ў 1914—18. У яго творчасці адлюстравалася характэрная для зах.-еўрап. мастацтва 20 ст. падкрэслена-суб'ектыўнае ўспрыняцце свету. У сваіх чыстых і лёгкіх па колеры, беглых па малюнку карцінах і акварэлях (са скачкамі, рэгатамі, канцэртамі) Дз. імкнуўся да ўвасаблення жыццярадасна-святочнага боку жыцця («Афішы Трувіля», 1906, «Прыстань» 1908, «Скачкі ў Давілі», 1930). Ілюстраваў таксама кнігі, рабіў малюнкі для тканін і габеленаў.

Р.**Дзюфі**. Прыстань. 1908.

ДЗЮША́НЕЯ (Duchesnea), манатыпны род кветкавых раслін сям. ружавых. 1 від — Дз. індыйская (D. indica). Пашыраны ва Усх. Азіі, інтрадукаваны ў многія краіны, у т.л. на Беларусь.

Шматгадовая апушаная травяністая расліна з паўзучым аблісцелым сцяблом даўж. да 1 м. Прыкараневае лісце доўгачаранковае, трайчастае, сцябловае — кароткачаранковае, адваротнаяйцападобнае або рамбічнае. Кветкі жоўтыя, адзіночныя, на доўгіх тонкіх кветаножках. Плод — жоўтая несапраўдная ягада. Лек., харч. і дэкар. расліна.

ДЗЮШЭС ЛЕ́ТНІ, сорт грушы нар. селекцыі. Раянаваны на Беларусі, акрамя Гомельскай вобл.

Дзюшэс летні.

Дрэва моцнарослае, крона шырокапірамідальная, негустая. Пачынае плоданашэнне на 7-ы год. Сорт зімаўстойлівы, сярэднеўраджайны, моцна пашкоджваецца бактэрыяльным ракам і паршой. Плады ніжэй за сярэднюю велічыню (50—70 г), шырокагрушападобныя. Скурка зеленавата-жоўтая з буравата-чырвоным румянцам і цёмна-кармінавымі крапінкамі на сонечным баку. Мякаць жаўтавата-белая, сакаўная, прыемнага салодкага смаку з ледзь прыкметнай кіслінкай. Спажывецкая спеласць у сярэдзіне жніўня.

М.Р.Мялік.

ДЗЯВО́ЛТВА, гістарычная балцка-літоўская вобласць. Няпэўнасць крыніц спарадзіла цяжкасць у вызначэнні тэр. Дз.: Хроніка Быхаўца (16 ст.) вызначыла яе ў раёне г. Вількамір (цяпер г. Укмерге, Літва); паводле гісторыка У.Ц.Пашуты, яна знаходзілася ў міжрэччы Нявежы і Швянтоі або на У ад р. Швянтоі, дзе звычайна паказваецца Аўкштайція. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1219. У 1264 заваявана кн. *Войшалкам* і ўключана ў склад ВКЛ.

Літ.: Ермаловіч М.І. Па слядах аднаго міфа. 2 выд. Мн., 1991. *М.І.Ермаловіч.*

ДЗЯВО́ЧАЕ ВО́ЗЕРА, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. ў бас. р. Тураўлянка, за 18 км на ПнУ ад г. Лепель. Пл. 0,51 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 520 м, найб. глыб. 17,5 м, даўж. берагавой лініі каля 4 км. Пл. вадазбору 4,15 км^2. Схілы катлавіны выш. 6—10 м (на Пд і ПдУ да 20 м), пад хмызняком, месцамі ў верхняй ч. разараныя. Берагі нізкія, участкамі зліваюцца са схіламі. Дно выслана пяском (да глыб. 2—3 м) і гляямі. Надводная расліннасць утварае паласу шыр. да 35 м. З возера выцякае ручай у воз. Чаросава.

ДЗЯВО́ЧАЯ ВЕ́ЖА, Кыз-каласы, Гыз-галасы, помнік сярэдневяковай азерб. архітэктуры. Пабудавана ў 12 ст. ў Баку (арх. Масуд ібн Давуд). Зроблена з вапняку. Вялізны цыліндрычны аб'ём (унутры 8-ярусны, выш. 27 м, таўшчыня сцен фундамента 5 м) з выступам з усходу. Заглыбленыя гарыз. рады камянёў утвараюць своеасаблівую рабрыстую паверхню фасада.

Дзявочая вежа.

ДЗЯВО́ЧКА Міхаіл Фадзеевіч (1863, Мінск — ?), бел. спартсмен-веласіпедыст. Служачы Лібава-Роменскай чыгункі. Пераможца гонак Масква — Ніжні Ноўгарад, Пецярбург — Масква. Чэмпіён Расіі (1894) і Англіі (1896) у гонках на трэку.

ДЗЯВО́ЧНІК, у беларусаў даўні звычай наладжваць вечарынку ў нявесты напярэдадні *вяселля*; тое, што і *суборная субота*.

ДЗЯВО́ЧЫ ВІНАГРА́Д (Parthenocissus), род кветкавых раслін сям. вінаградавых. 15 відаў. Пашыраны ва ўмераных паясах Паўн. Амерыкі, ва Усх. Азіі і на Гімалаях. На Беларусі інтрадукаваны 3 віды: Дз.в. пяцілісточкавы (P. quinquefolia), прымацаваны (P. inserta), трохвостраны (P. tricuspidata).

Дзявочы вінаград восенню.

Дрэвавыя лістападныя, рэдка шматгадовазялёныя ліяны з лазячымі сцяблами. Лісце зубчастае, цёмна-зялёнае, на доўгіх чаранках, увосень набывае пурпуровы колер. Кветкі дробныя, зеленаватыя, двухполыя або толькі мужчынскія, з недаразвітай завяззю, сабраныя ў паўпарасонікі ці шчыткі. Плод — дробная шарападобная цёмна-шызая ягада. Дэкар. расліны. Размнажаюцца атожылкамі, чаранкамі, насеннем. *Г.У.Вынаеў.*

ДЗЯГІЛЕ́ВІЧ Уладзіслаў (каля 1674, Беларусь — 13.1.1714), бел. архітэктар. Прадстаўнік архітэктуры барока. У 1691 уступіў у ордэн езуітаў. Вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме (1695—98), езуіцкім паслушніцкім доме ў Вільні (1701—04). Працаваў у Оршы (1704—05 і 1707—09), Нясвіжы (1705—06), Мсціславе (1706—07). У 1707 у Мсціславе паводле яго праекта пабудаваны драўляны езуіцкі касцёл, у 1711 — званіца і гасп. пабудова.

ДЗЯ́ГІЛЕЎ Сяргей Паўлавіч (31.3.1872, б. маёнтак Грузіна, Наўгародская вобл., Расія — 19.8.1929), рускі тэатральны і мастацкі дзеяч. У 1896 скончыў юрыд. ф-т Пецярбургскага ун-та, адначасова вучыўся ў Пецярбургскай кансерваторыі ў М.Рымскага-Корсакава. Вывучаў жывапіс, т-р, гісторыю маст. стыляў. Адзін з заснавальнікаў аб'яднання «*Свет мастацтва*» і рэдактар (разам з А.Бенуа) аднайм. часопіса (1899—1904). У 1906—07 арганізоўваў у Парыжы, Берліне, Монтэ-Карла, Венецыі выстаўкі рус. мастакоў, з 1907 — штогадовыя выступленні за мяжой рус. артыстаў, т.зв. «Рускія сезоны», у 1907 — сімф. канцэрты (наз. «Гістарычныя рус. канцэрты»), у 1908 — сезоны рус. оперы. Стваральнік трупы «*Рускі балет Дзягілева*» (1911—29). У балеце як правадніку новых ідэй мастацтва бачыў сінтэз сучаснай музыкі, жывапісу, харэаграфіі; садзейнічаў стварэнню яркіх балетных спектакляў (у т.л. балеты

С.П.Дзягілеў. Фрагмент карціны Л.Бакста. 1906.

«Жар-птушка», «Пятрушка», «Вясна свяшчэнная», «Вяселейка», «Апалон Мусагет» І.Стравінскага, «Стальны скок», «Блудны сын» С.Пракоф'ева, а таксама К.Дэбюсі, М.Равеля, кампазітараў «*Шасцёркі*» і інш.). Для афармлення спектакляў запрашаў найб. вядомых рас. мастакоў. Балеты ставілі М.Фокін, В.Ніжынскі, Л.Мясін, Б.Ніжынская, Дж.Баланчын і інш.; сярод танцоўшчыкаў Т.Карсавіна, М.Кшасінская,

М.Мордкін, Г.Паўлава і інш. Тэатральныя антрэпрызы Дз. зрабілі вял. ўплыў на развіццё сусв. харэаграфіі.

Літ.: Красовская В.М. Русский балетный театр начала XX в. [Ч.] 1. Хореографы. Л., 1971; Сергей Дягилев и русское искусство: Ст., открытые письма, интервью. Переписка. Современники о Дягилеве. [Т.] 1—2. М., 1982; Лифарь С. М.С.Дягилевым. СПб., 1994.

ДЗЯ́ГІЛІ, возера ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Вузлянка, за 7 км на ПнУ ад г.п. Мядзел. Пл. 1,37 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 1,2 км, найб. глыб. 1,7 м, даўж. берагавой лініі каля 4,4 км. Пл. вадазбору 4 км^2. Схілы катлавіны выш. 1 м (на Пн да 7 м), параслі хмызняком, на Пн участкамі разараныя. Берагі сплавінныя, тарфяністыя, пад хмызняком. Дно выслана сапрапелем, уздоўж паўн. берага — пяском. Шыр. паласы надводнай расліннасці да 50 м. З возера бярэ пачатак Дзягільскі канал.

ДЗЯ́ГІЛІ, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., каля воз. Дзягілі. Цэнтр сельсавета і дапаможнай сельскай гаспадаркі Мінскага маторнага з-да. За 13 км на ПнУ ад Мядзела, 153 км ад Мінска, 32 км ад чыг. ст. Варапаева. 282 ж., 103 двары (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДЗЯГІ́ЛЬ, гл. ў арт. *Дуднік*.

ДЗЯГЦЯ́НСКІ СКАРБ. Знойдзены ў 1957 на ўскраіне в. Дзягцяны Капыльскага р-на Мінскай вобл. Ухаваны каля 1050. Складаўся з 21 фрагмента сярэбраных ювелірных вырабаў з дробным зярненнем і сканню, 320 дэнарыяў Англіі (10 экз.), Венгрыі (3), Герм. імперыі (165), Даніі (1), Чэхіі (123), нявызначаныя (4), імітэты манет Англіі (3) і Германіі (9), фрагменты куфіцкіх дырхемаў Арабскага халіфата (2). Па колькасці чэшскіх дэнарыяў скарб не мае аналагаў на тэр. Усх. Еўропы.

ДЗЯГЦЯ́Р Мота Ізраілевіч (15.7.1909, в. Пціч Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. — 9.11.1939), яўрэйскі пісьменнік. Пісаў на ідыш. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1937). Друкаваўся з 1930. У кнігах апавяданняў, аповесцей і нарысаў «На рыштаваннях» (1934), «Савецкая Беларусь» (1935), «Будаўнікі» (1936), «Браты» (1937), «Верныя вартавыя» (1938), «Наша зямля» (1939) адлюстраваў падзеі грамадз. вайны, сацыяліст. пераўтварэнні ў краіне. Яго творы выключна лірычныя, у іх паэтызацыя палескага краю.

Тв.: Бел. пер. — Апавяданні. Мн., 1940.

ДЗЯГЦЯ́РКА, рака, гл. *Вільчанка*.

ДЗЯГЦЯ́РЫК Яўген Рыгоравіч (н. 2.12.1924, г. Пржавальск, Кыргызстан), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1954, клас А.*Багатырова*), з 1962 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі. Асн. жанры творчасці камерна-інстр. і камерна-вакальныя. Сярод твораў: кантата «Радзіма» на словы Я.Коласа (1954), «Карнавальная сюіта» (1959), паэмы «Мора», «Світанне» (1960), «Палессе» (1962) для сімф. арк.; рапсодыя на тэмы бел. нар. песень для цымбалаў з арк. (1962), увертюра (1964), «Беларуская сюіта» (1964); п'есы для аркестра бел. нар. інструментаў; камерна-інстр. ансамблі і п'есы; вак. цыклы на словы М.Багдановіча, Ш.Пецёфі, А.Міцкевіча, М.Хведаровіча; хар. цыкл «Ляцяць песні над Белай Руссю» на словы нар. і Я.Купалы. *Р.М.Аладава.*

ДЗЯ́ДЗІНА, дзядзькава жонка.

ДЗЯДЗІ́НЕЦ, 1) цэнтральная частка сядзібы, двор. 2) Цэнтр. частка стараж. горада, умацаваная драўляным тынам, равамі і валамі (пазней мураванымі сценамі і драўлянымі вежамі), у якой размяшчаліся адм. і культавыя пабудовы, жылі князь з дружынай, чэлядзь, гандляры, рамеснікі, духавенства. Пл. 1—7 га (полацкага каля 7 га, мінскага 3 га, віцебскага 2,5 га, друцкага каля 1 га). У стараж. летапісах слова «Дз.» ужывалася да 14 ст.

«ДЗЯ́ДЗЬКА АНТО́Н», перакладны твор бел. л-ры 19 ст. Пераклад зроблены з польск. агітацыйнай брашуры «Бацька Шыман», якая з'яўляецца перапрацоўкай рус. публіцыстычнай брашуры А.Іванова (В.Варзара) «Хітрая механіка» (Цюрых, 1874). Выдадзена ў 1892 М.*Абрамовічам* у Тыльзіце (на тытуле для канспірацыі пазначана Вільня) пад назвай «Дзядзька Антон, або Гутарка аб усім чыста, што баліць, а чаму баліць — не ведаем...». Да тыльзіцкага выдання мела дачыненне інтэрнац. студэнцкая арг-цыя ў Маскве (уваходзілі Абрамовіч, В.Вароўскі, Н.Чарноцкі і інш.). Пераклад разлічаны на бел. чытача. Твор напісаны ў форме навук.-папулярнай гутаркі па палітэканоміі, удала спалучае агітацыйную публіцыстыку і маст. прозу. Апавядальнік Антон, які раней настаўнічаў, працаваў на ф-ках, абураецца, што мужык жыве «ў бядзе, голадзе дый холадзе», аналізуе аграрнае пытанне, стан нар. асветы, выдаткі на цара і царскую сям'ю, дзярж. апарат, армію, заклікае бел. сялян браць прыклад з рускіх, якія выступаюць супраць цара. Гутарка заканчваецца заклікам (у польскім арыгінале яе няма): «А цяпер — проці ў цара і яго чыноўнікаў пойдзем!» Ранейшым варыянтам «Дз.А.» з'яўляецца «*Старая прысказка*», выдадзеная К.Гучкоўскім у 1887 у Львове (канфіскавана паліцыяй, вядомы экз. зберагаецца ў Цэнтр. гіст. архіве Украіны ў Львове). У 1903 выдадзены ў Лондане новы пераклад і новая апрацоўка брашуры пад назвай «Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць» (перавыд. ў Пецярбургу ў 1907, забаронена цэнзурай). Аўтарства твора доўгі час памылкова прыпісвалася А.Гурыновічу.

Публ.: Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. 2 выд. Мн., 1988.

Літ.: Александровіч С.Х. Пуцявіны роднага слова. Мн., 1971. С. 77—82, 118, 122, 155; Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. 2 выд. Мн., 1984. *В.У.Скалабан.*

ДЗЯДЗЬКАВА́ННЕ, у беларусаў звычай аддаваць дзяцей шляхты на выхаванне ў сялянскую сям'ю. Быў пашыраны ў канцы 16—18 ст. і выкліканы жаданнем выхаваць у дзяцей станоўчыя фіз. і духоўныя якасці простага народа: працавітасць, сілу, вынослівасць, неперабарлівасць у ядзе і адзенні, любоў да зямлі.

ДЗЯДЗЮ́ШКА Уладзімір Іосіфавіч (14.2.1905, Мінск — 30.3.1973), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1949), нар. арт. СССР (1971). Сцэн. дзейнасць пачаў як акцёр-аматар. У 1923—37 акцёр у т-ры У.Галубка (БДТ-3). З 1937 у Бел. т-ры імя Я.Купалы. Характарны, самабытны акцёр з яркім нац. каларытам; адзін з найб. буйных дзеячаў бел. т-ра. Яго творчасць вызначалася глыбінёй спасціжэння нар. характару, уменнем псіхалагічна абгрунтаваць учынкі герояў, надаць ролі выразную сцэн. форму. Асаблівы поспех меў у нац. рэпертуары: Сцяпан Крыніцкі («Паўлінка» Я.Купалы), Мірон Бокуць («Пагібель воўка» Э.Самуйлёнка), Ксаверый («Кацярына Жарнасек» М.Клімковіча), Пытляваны («Пяюць жаваранкі» К.Крапівы; Дзярж.



У.І.Дзядзюшка.

У.Дзядзюшка ў ролі Крушыны (злева).

прэмія СССР 1952), Язэп («Салавей» З.Бядулі), Моцкін («Выбачайце, калі ласка!» А.Макаёнка), Крушына («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона; і ў кіно). З інш. яркіх вобразаў: Іларыён («Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н.Думбадзе і Р.Лордкіпанідзе), Месны, Вакуленка («Фронт», «Калінавы гай» А.Карнейчука), Пімен («Барыс Гадуноў» А.Пушкіна), Дон Джэром («Дзень цудоўных падманаў» Р.Шэрыдана). Здымаўся ў кіно («Несцерка», «Паўлінка», «Запомнім гэты дзень») і тэлевізійных пастаноўках («Людзі на балоце» паводле І.Мележа, «Прымакі» Я.Купалы) і інш.

ДЗЯДКІ́ (Agrimonia), род кветкавых раслін сям. ружавых. 10 відаў. Пашыраны пераважна ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі 3 дзікарослыя віды: Дз. аптэчны, або звычайныя (A. eupatoria), валасістыя (A. pilosa) і высокія, або пахучыя (A. procera). Растуць у шыракаліс-тых і шыракаліста-хваёвых лясах, на сухіх схілах, у хмызняках і інш. У Цэнтр. бат. сад Нац. АН інтрадукаваны 2 віды, з якіх найб. перспектыўныя як лек. і фарбавальныя расліны Дз. азіяцкія (A. asiatica).

Дзядкі аптэчныя.

Шматгадовыя залозіста-апушаныя травяністыя расліны з высокімі прамастойнымі простымі ці галінастымі сцябламі і кароткімі карэнішчамі. Лісце чаргаванае, няпарнаперыстае. Кветкі дробныя, двухполыя, 5-членныя, жоўтыя, у доўгіх коласападобных гронках. Плод — 1—2-арэшак, укрыты кручкападобнымі шчацінкамі (адсюль бел. назва роду), з дапамогай якіх ён чапляецца да шэрсці жывёл і вопраткі людзей. Лек., эфіраалейныя, дубільныя, фарбавальныя і дэкар. расліны.

Г.У.Вынаеў.

ДЗЯДКО́Ў Ігар Аляксандравіч (11.4.1934, г. Смаленск, Расія — 27.12.1994), рускі крытык і літ.-знавец. Скончыў Маскоўскі ун-т (1957). У 1957—76 у газ. «Северная правда» (Кастрама). Літ. дзейнасць пачаў у 1958. Даследаваў сучасную прозу. Аўтар кн. «Васіль Быкаў» (1980), у якой падрабязна прааналізаваў творчасць бел. пісьменніка, рэцэнзій на аповесці В.Быкава «Дажыць да світання» і «Пайсці і не вярнуцца», раман «Карнікі» А.Адамовіча.

Тв.: Возвращение к себе. М., 1978; Во все концы дорога далека. Ярославль, 1981.

ДЗЯДО́К Вольга Анатолеўна (21.12.1906, г. Гомель — 10.10.1974), бел. скульптар. Вучылася ў Ленінградзе ў Вышэйшым маст.-прамысл. ін-це (1924—26) і Ін-це пралет. выяўл. мастацтва (1926—31). Працавала ў станковай і манум. скульптуры. Аўтар кампазіцый «Партызанка» (1947), «Даярка» (1950), «Юнацтва» (1963), «Парыў» (1964); барэльефаў Д.Ібаруры (1949), Дз.І.Мендзялеева (1955), В.А.Моцарта (1956), жаночага партрэта (1970) і інш.

В.Дзядок. Даярка. 1950.

ДЗЯДЫ́, народны памінальны абрад у беларусаў, рытуальная вячэра ў памяць памерлых родзічаў. Дзядамі называлі таксама дзень, калі адбываўся абрад, і нябожчыкаў, якіх ушаноўвалі. Паходзяць ад дахрысц. ўсх.-слав. звычаю *трызны*; звязаны з *культам продкаў*. Пазней абрад ускладніўся напластаваннем хрысц. культу. Дз. спраўлялі ў пэўныя дні 3—4 і больш разоў на год (у залежнасці ад мясцовасці) вясною і ўвосень. Галоўнымі былі змітраўскія Дз. (асяніны) — у суботу перад Змітравым днём (26 кастр. с. ст.), на радаўніцу, а таксама перад масленіцай, сёмухай. На Дз. гатавалі святочныя і абрадавыя стравы (абавязковымі былі куцця, бліны, клёцкі, яечня, мяса). Паводле звычаю ад кожнай з іх сімвалічна адкладвалі ў асобны посуд нябожчыкам. У наш час Дз. (Дзень памяці) адзначаюць 2 лістапада.

ДЗЯЖА́, дзежка, хлебніца, бандарны выраб, пасудзіна для заквашвання цеста ў беларусаў і некаторых інш. слав. народаў. Мела форму звужанай угору шырокай бочачкі (вышыня раўнялася дыяметру вусця, аб'ём 20—30 л), накрыўку (вечка) з абечкам. Дз. малых памераў (блінніца) служыла для заквашвання цеста на бліны. Рабілі Дз. звычайна з дубовых клёпак. Функцыянальнае выкарыстанне Дз. звязана з культам хлеба, яна выконвала важную ролю ў абрадзе *вяселля* і інш. У сельскай мясцовасці бытавала да сярэдзіны 20 ст.

Дзяжа.

В.С.Цітоў.

ДЗЯЖНЁВА МЫС, паўднёва-ўсходні край мацерыка Еўразія на Чукоцкім п-ве, у Берынгавым праліве (66°05′ паўн. ш., 169°40′ зах. д.). Ізаляваны плоскавяршынны горны масіў выш. да 741 м, які строма абрываецца да мора. Названы ў 1879 Н.А.Э.*Нордэншэльдам* у гонар рус. землепраходца С.І.*Дзяжнёва*, які ўпершыню абагнуў з Паповым (Ф.Аляксеевым) мыс у 1648. Маяк-помнік Дзяжнёву. На Дз.м. населены пункт Уэлен.

ДЗЯЖНЁЎ Сямён Іванавіч (каля 1605—73), рускі землепраходзец. На пач. 1640-х г. разам з М.Стадухіным і інш. ўдзельнічаў у паходах па Крайняй Поўначы Сібіры: спусціўся па р. Індыгірка да паўн. Ледавітага ак., потым па моры дасягнуў р. Калыма, адтуль у 1648 з Паповым (Ф.Аляксеевым) праплыў вакол Чукоцкага п-ва і адкрыў праліў паміж Азіяй і Амерыкай. Імем Дз. названы мыс і хрыбет на Чукотцы, бухта ў Берынгавым м.

ДЗЯК (ад грэч. diakonos служыцель), 1) начальнік, пісьмавод канцылярыі роз-

ных установ у Расіі да 18 ст. Напачатку слуга князя, якому даручаліся казна і пісьмовыя справы, з 15 ст. — чын урадавай адміністрацыі, кіраўнік канцылярыі цэнтр. (т.зв. прыказа) і мясц. устаноў. Адрознівалі Дз. гасударавых (царовы, вял. князя, дварцовы), буйных феадалаў, вечавыя (пры гар. вечы), гарадскія, земскія і інш. З 16 ст. былі думныя Дз. (засядалі ў Баярскай думе). У ВКЛ функцыі Дз. выконвалі сакратар і пісар. 2) Святар у праваслаўнай царкве, у абавязкі якога ўваходзіць чытанне св. пісання і спевы на клірасе.

ДЗЯ́КАВІЧЫ, вёска ў Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 57 км на ПнУ ад Жыткавіч, 270 км ад Гомеля, 32 км ад чыг. ст. Старушкі. 721 ж., 278 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму.

ДЗЯ́КАНАЎ Міхаіл Аляксандравіч (12.1.1856, г. Екацярынбург, Расія — 10.8.1919), расійскі гісторык. Акад. Пецярбургскай АН (1912). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1878). З 1890 праф. гісторыі і права Дэрпцкага (Тартускага), з 1914 Пецярбургскага ун-та. Навук. працы па гісторыі сялянства, дзяржавы і царквы ў Расіі, стараж.-рус. права, асн. з іх — «Улада маскоўскіх гасудароў» (1889), «Нарысы па гісторыі вясковага насельніцтва ў Маскоўскай дзяржаве XVI—XVII ст.» (1898), «Нарысы грамадскага і дзяржаўнага ладу Старажытнай Русі» (1907).

ДЗЯ́КАНАЎ Станіслаў Дзмітрыевіч (н. 27.3.1932, г. Бранск, Расія), бел. мастак. Скончыў маст. студыю ў г. Курск (1957). Сярод твораў на гіст. тэму: «Напярэдадні» (1969), «Памяць» (1975), «Гаспадары шляхоў» (1977), «Світанку насустрач» і «Памяць бессмяротная» (абедзве 1982), «Герояў, палеглых і жывых, вянчае славаю народ» (1985) і інш. У шэрагу партрэтаў і пейзажаў адлюстраваў унутраны свет чалавека і прыгажосць бел. зямлі («Беларускі світанак», 1977, серыя «Ваколіцы маёй Навабеліцы», 1992—97). Піша нацюрморты.

ДЗЯ́КАЎ Іосіф Іванавіч (4.4.1903, г. Гомель — 11.1.1984), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў пях. школу імя Саўнаркома БССР (1922), Вышэйшую с.-г. школу (1939). Удзельнік грамадз. вайны на Зах. фронце. У Вял. Айч. вайну са студз. 1942 на Зах., Цэнтр., 3-м Бел. і 1-м Укр. франтах. Парторг батальёна ст. лейт. Дз. вызначыўся ў 1944: у чэрв. ў час бою ў Дубровенскім р-не падняў воінаў у атаку; у ліп. ў баі за г. Гродна замяніў параненага камандзіра роты і павёў байцоў на прарыў абароны праціўніка, адзін з першых уварваўся ў горад. Да 1970 на парт. і сав. рабоце на Гомельшчыне.

ДЗЯ́КАЎ Уладзімір Анатолевіч (14.6.1919, с. Бакалы, Башкортастан — 16.11.1995), рускі гісторык. Д-р гіст. н. (1966), праф. (1986). Скончыў Маскоўскі гісторыка-архіўны ін-т (1947). З 1957 у Цэнтр. дзярж. ваенна-гіст. архіве і ў Галоўархіве СССР, з 1960 у Ін-це славяназнаўства і балканістыкі Рас. АН. Даследаваў пытанні рэв. і нац.-вызв. руху Расіі і Польшчы 19 — пач. 20 ст., руска-польскія рэв. і культ. сувязі таго часу, гісторыю славяназнаўства, балканістыкі і інш. Адзін з рэдактараў і складальнікаў сав.-польскай серыі «Паўстанне 1863 года. Матэрыялы і дакументы» (т. 1—25. М.; Варшава, 1961—87), 2 тамы якога прысвечаны Беларусі: «Рэвалюцыйны ўздым у Літве і Беларусі 1861—1862 гг.» (1964) і «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг.» (1965). Паўстанню 1863—64 у Беларусі і Літве прысвечаны таксама працы «Сігізмунд Серакоўскі» (1959) і «Валерый Урублеўскі» (1968; разам з У.Абрамавічусам).

В.Ф.Шалькевіч.

ДЗЯ́КЛА, дзяклo, прадуктовая рэнта (натуральны аброк) за зямельны надзел, якая збіралася на карысць землеўладальніка з сялян у ВКЛ. Дз. здавалі збожжам (пераважна жытам і аўсом, радзей ячменем і пшаніцай), інш. с.-г. прадуктамі або грашыма (па жаданні ўладальніка). Да *валочнай памеры* адзінкай абкладання былі *дварышча* і служба, пазней — *валока* і *дым*. Памер Дз. ў розных уладаннях вагаўся, найб. пашыранае — па 1—2 бочкі жыта і аўса. З развіццём таварна-грашовых адносін у 2-й пал. 18 — 1-й пал. 19 ст. паступова выцеснена адработачнай і грашовай рэнтамі.

В.І.Мялешка.

ДЗЯКО́НСКІ (Dziekoński) Бартломей, польскі эканаміст 18—19 ст. Д-р філасофіі. У 1764—1801 працаваў выкладчыкам у беластоцкіх школах. Падрыхтаваў шэраг падручнікаў і дапаможнікаў па земляробстве і эканам. пытаннях для школ Адукацыйнай камісіі. Выдаў у Супраслі свае працы «Асновы аграноміі, рукадзелля і гандлю...» (1790), «Правілы земляробства і агародніцтва...» (1796), «Земляробства і агародніцтва» (1805).

ДЗЯКО́ЎСКАЯ КУЛЬТУ́РА, культура фіна-угорскіх плямён, якія ў 7 ст. да н.э. — 5 ст. н.э. жылі ў міжрэччы Волгі і Акі, у Верхнім Падзвінні, на Валдайскім узвышшы. Назву атрымала ад гарадзішча каля в. Дзякова (у межах Масквы). Насельніцтва жыло патрыярхальнымі сем'ямі ў наземных жытлах і паўзямлянках на гарадзішчах і паселішчах. Займалася жывёлагадоўляй, лядным земляробствам, паляваннем і рыбалоўствам, вырабляла жал. і касцяныя прылады працы, бронзавыя ўпрыгожанні. Кераміка слоікападобнай формы з тэкстыльнымі адбіткамі (адсюль інш. назва Дз. к. — тэкстыльнай керамікі культура) і арнаментам на верхняй частцы пасудзін. На тэр. Беларусі найб. даследаваныя помнікі: Загорцы, Новы Болецк, Мямлі (Гарадоцкі р-н) і інш.

Літ.: Третьяков П.Н. Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге. М.; Л., 1966.

ДЗЯЛЕ́НДЗІК Анатоль Андрэевіч (н. 4.3.1934, в. Кулакі Салігорскага р-на Мінскай вобл.), бел. драматург. Скончыў Мінскі мед. ін-т (1957), Літ. ін-т імя М.Горкага (1969). У 1943 разведчык у партыз. атрадзе. Працаваў урачом-псіхіятрам. У 1968—80 на кінастудыі «Беларусьфільм». Друкуецца з 1955. Першы зб. гумару і сатыры «Пагібель «Тытаніка» (1963). Аўтар драм «Выклік багам»

І.І.**Дзякаў**.

А.А.**Дзялендзік**.

(паст. 1965), «Грэшная любоў» (паст. 1967), «Начное дзяжурства» (паст. 1970), «Гаспадар» (паст. 1984), камедый «Абы ціха» (1964), «Амазонкі» (паст. 1972), «Аперацыя «Мнагажэнец» (паст. 1974), «Гіпапатам» (1981), «Аўкцыён» (паст. 1988), «Дурнічка» (паст. 1996), «Султан Брунея» (паст. 1997), «Заморскі жаніх» (паст. 1998), шэрагу аднаактовых п'ес. Напісаў сцэнарыі тэлефільмаў «Спазнай сябе» (1972), «Блакітны карбункул» (1979), маст. фільмаў «Заўтра будзе позна» (з М.Крно, 1973), «Нязручны чалавек» (1985), «Ваўкі ў зоне» (1990), радыёп'ес. Асн. тэмы твораў Дз. — маральна-этычныя праблемы, сям'я, дачыненні асобы і калектыву, складанасць чалавечых характараў. Для іх характэрны сцэнічнасць, эмацыянальная і псіхал. напружанасць дзеі, вастрыня драм. калізій.

Тв.: Аперацыя «Мнагажэнец». Мн., 1981; П'есы. Мн., 1985; Дамы покупают кавалеров. Мн., 1998; Грешница. Мн., 1998.

Літ.: Орлова Т. Ты и я. Мн., 1969. С. 174—193; Беларуская драматургія, 1966—1986: Бібліягр. давед. Мн., 1993. С. 97—103.

І.У.Саламевіч.

ДЗЯЛЕ́ННЕ ў біялогіі, працэс размнажэння клетак, у выніку якога з зыходнай мацярынскай утвараюцца новыя, даччыныя клеткі. Ляжыць у аснове росту тканак і працэсаў палавога размнажэння ў шматклетачных арганізмаў, у аднаклетачных арганізмаў забяспечвае рост іх колькасці. Працэс Дз. звычайна суправаджаецца глыбокімі зменамі ў клетачным ядры. Дзякуючы Дз. забяспечваецца няспыннасць існавання паслядоўных пакаленняў клетак і цэлых арганізмаў. У пракарыётаў (напр., бактэрый), клеткі якіх не маюць марфалагічна адасобленага ядра, Дз. ажыццяўляецца шляхам утварэння папярочнай перагародкі, пачкаваннем або множным Дз. з папярэднім падваеннем (рэпліка-

цыя) генетычнага матэрыялу. У эўкарыётаў, клеткі якіх маюць ядро, адрозніваюць 2 тыпы Дз.: *мітоз*, уласцівы ўсім саматычным клеткам жывёльных і раслінных арганізмаў, і *меёз*, характэрны для палавых клетак чалавека і жывёл, а таксама раслін, што размнажаюцца палавым шляхам. У выніку меёзу ўзнікаюць палавыя клеткі з гаплоідным (адзінарным) наборам храмасом. У некаторых выпадках адбываецца прамое Дз. (*амітоз*) без утварэння храмасом і перабудовы ядра (рэакцыя тканкі на зменены ўмовы асяроддзя).

ДЗЯЛЕ́ННЕ, арыфметычнае дзеянне, адваротнае *множанню*. Падзяліць лік a (дзеліва) на b (дзельнік адрозны ад нуля) — значыць знайсці такі лік x (дзель), што здабытак bx = a (або xb = = a). Для абазначэння Дз. выкарыстоўваюць знакі двукроп'я (a:b), гарыз. ($\frac{a}{b}$) або нахільнай (a/b) рысы.

Для рацыянальных лікаў (цэлых, дробных і нуля) Дз. адназначнае і заўсёды магчымае (акрамя Дз. на нуль, што немагчыма). У межах цэлых лікаў — адназначнае, але не заўсёды магчымае, напр., 6 дзеліцца на 2 і 3, але не дзеліцца на 5. Абагульненнем звычайнага Дз. з'яўляецца Дз. з астачай. Падзяліць цэлыя неадмоўныя лікі a на b — знайсці такія цэлыя неадмоўныя лікі x і y, якія задавальнялі б патрабаванні a = bx + y, y < b, дзе x — няпоўная дзель (пры y ≠ 0) ці дзель (пры y = 0); y — астача. Гл. таксама *Падзельнасць*.

ДЗЯЛЕ́ННЕ Я́ДРАЎ, працэс, пры якім *ядро атамнае* дзеліцца на 2 і больш частак (асколкаў) з блізкімі масамі; суправаджаецца вылучэннем γ-квантаў і нейтронаў. Можа адбывацца самаадвольна (спантанна) або пры ўзаемадзеянні ядра з часціцамі і γ-квантамі. Пры Дз.я. урану, плутонію і інш. ствараюцца ўмовы для развіцця *ланцуговай ядзернай рэакцыі*, якая выкарыстоўваецца ў ядз. энергетыцы.

Пачатковая стадыя Дз.я. — павольная змена формы ядра, пры якой утвараецца шыйка, што злучае 2 яшчэ не сфарміраваныя асколкі (час праходжання гэтай стадыі залежыць ад энергіі ўзбуджэння ядра); паступова шыйка патанчаецца і ў некаторы момант часу адбываецца яе разрыў і асколкі разлятаюцца ў процілеглыя бакі. У 1938 ням. вучоныя О.Ган і Ф.Штрасман устанавілі, што пры бамбардзіроўцы урану нейтронамі ўтвараюцца ядры шчолачназямельных элементаў (напр., барыю). Спантаннае Дз.я. адкрыта эксперыментальна Г.М.Флёравым і К.А.Петржакам (1940). *А.В.Берастаў.*



Паслядоўныя стадыі **дзялення ядра**.

ДЗЯЛІ́ЛЬНІК, 1) Дз. напружання — электратэхнічная прылада для дзялення напружання пастаяннага (ці пераменнага) току на часткі. Складаецца з актыўных або рэактыўных электрычных супраціўленняў. Пры нізкіх напружаннях выкарыстоўваюць актыўныя (амічныя) Дз., для пераменнага току, акрамя таго, рэактыўныя (ёмістыя, індуктыўныя) Дз., для высокіх напружанняў — ёмістыя (на пераменным току) і актыўныя (на пастаянным току). З дапамогай Дз. адбіраюць невял. магутнасці ад лініі электраперадачы, вымяраюць напружанне і інш. Гл. таксама *Атэнюатар*, *Рэастат*. 2) Дз. частаты — радыёэлектронная прылада для змяншэння частаты падведзеных эл.-магн. ваганняў у цэлую колькасць разоў. Для дзялення частаты выкарыстоўваюць нелінейныя прылады: электронныя лічыльнікі, імпульсныя генератары (напр., блокінг-генератары, мультывібратары), генератары з самаўзбуджэннем



Нізкавольтныя **дзяльнікі** напружання: 1 — амічны; 2 — ёмістасны; 3 — індуктыўны; U_1 — уваходнае напружанне; U_2 — выхаднае напружанне.

і інш. Выкарыстоўваюць у сінтэзатарах частот, хранізатарах, кварцавых гадзінніках, радыё- і вымяральнай тэхніцы, электрасувязі, радыёлакацыі, тэлебачанні і інш.

ДЗЯЛІ́ЛЬНЫЯ МАШЫ́НЫ І ПРЫСТАСАВА́ННІ. Дзялільная машына — станок для нанясення дзяленняў (штрыхоў) на лінейках, шкалах прылад, растрах і інш. Найб. пашыраны аўтам. разцовыя машыны для нанясення лінейных і вуглавых шкал на вымяральных інструментах і прыладах. Дзялільная галоўка — прыстасаванне металарэзных (пераважна фрэзерных) станкоў для павароту на пэўны вугал дэталі, якая апрацоўваецца. Бываюць мех. і аптычныя. З іх дапамогай фрэзеруюць упадзіны паміж зубамі зубчастых колаў і рэжучых інструментаў, апрацоўваюць шматграннікі і інш. Дзялільныя прыстасаванні служаць для дакладнага паварочвання або прасоўвання дэталей пры апрацоўцы і вымярэнні паверхняў, нарэзанні шліцаў, спіральных пазоў і інш. Да іх адносяцца механізмы павароту сталоў разметачна-расточных, зубастругальных і інш. станкоў, а таксама барабанаў, рэвальверных галовак. На універсальных дзялільных прыстасаваннях звычайна апрацоўваюць складаныя дэталі. Для дакладных вымярэнняў яны аснашчаюцца мікраскопам.

ДЗЯЛЯ́ЦІЧЫ, вёска ў Любчанскім с/с Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл., на левым беразе р. Нёман. За 30 км на ПнУ ад Навагрудка, 180 км ад Гродна, 55 км ад чыг. ст. Наваельня. 335 ж., 191 двор (1997).

Вядомы з 2-й пал. 14 ст. як велікакняжацкі двор. На карце Т.Макоўскага (1613) пазначаны як мястэчка. У 17 — 1-й пал. 19 ст. ўласнасць Радзівілаў. У 1652 у Дз. 101 двор, царква, рынак. З 1795 у Рас. імперыі, у Навагрудскім пав. У 1897 — 1509 ж., 229 двароў, 2 школы, 2 царквы, 2 млыны, карчма, крама. У 1921—39 у Польшчы, у Навагрудскім пав. З 1939 у БССР. У 1940—56 у Любчанскім р-не. З 1956 у Навагрудскім р-не. У 1971 — 895 ж., 360 двароў. Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнікі архітэктуры — царква (19 ст.) і жылы дом (19 ст.).

ДЗЯМА́РЫН Аляксандр Міхайлавіч (н. 15.3.1938, г. Багародск Ніжагародскай вобл., Расія), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966), выкладаў у ім (1969—78). Арыгінальнасцю кампазіцыі, тонкім адчуваннем псіхалогіі вобразаў вылучаюцца серыі станковых работ «Не забудзе Беларусь» (1970), «Камвольшчыцы» (1974—77), «На сюжэты з рускай класікі» (1980—88), «Калектывізацыя на Палессі» (1982), трыпціх «Нараджэнне тканіны» (1978). Выканаў іл. да кніг Я.Коласа «На ростанях» (1968), М.Лынькова «Векапомныя дні» (1969), І.Мележа «Мінскі напрамак» (1974), І.Шамякіна «Сцягі над штыкамі» (1976) і інш. Працуе таксама ў жывапісе: «Пераправа, 1944 г.» (1985), «29-ы год. Палессе» (1987) і інш.

ДЗЯМЕ́НЦЬЕВА Людміла Сяргееўна (н. 4.5.1938, с. Чарноўскія Копі Чыцінскай вобл., Расія), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1978). Скончыла студыю пры Бел. т-ры імя Я.Купалы (1959). Працавала ў Брэсцкім абл. драм. т-ры (да 1963), Т-ры Паўн. флоту (1963—68). З 1968 у Гродзенскім абл. драм. т-ры. Характарная актрыса. Яе творчай манеры ўласцівы тонкае разуменне характару, глыбокае пранікненне ў яго сутнасць, выразны сцэн. малюнак.

Сярод роляў: Мальвіна («Несцерка» В.Вольскага), Альжбета («Паўлінка» Я.Купалы), Клаўдзія («Мілы чалавек» К.Крапівы), Міхаліна Матулевіч («Трывога» А.Петрашкевіча), Бабуля («Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н.Думбадзе і Р.Лордкіпанідзе), Аркадзіна («Чайка» А.Чэхава), Адрыяна («Ноч памылак» У.Шэкспіра).

ДЗЯМЕ́НЦЬЕЎ Андрэй Дзмітрыевіч (н. 16.7.1928, г. Цвер, Расія), рускі паэт. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага (1952). У 1981—92 гал. рэдактар час. «Юность». У лірыцы Дз. (зб-кі «Лірычныя вершы», 1955, «Роднае», 1958, «Сам-насам з сумленнем», 1965, «Побач ты і каханне», 1976, «Нараджэнне дня», 1978, «Азарт», 1983, Дзярж. прэмія СССР, 1985), «Характар» (1986) і паэмах («Мужнасць», 1958, «Дарога ў заўтра», 1960, «Расія», 1964) апявае духоўнае багацце чалавека, гучаць тэмы кахання і прыроды.

ДЗЯМЕ́НЦЬЕЎ Васіль Аляксеевіч (4.4.1908, с. Судбішча Арлоўскай вобл., Расія — 12.12.1974), бел. географ. Праф. (1961). Скончыў Ленінградскі

ун-т (1930). З 1940 у БДУ. З 1962 прэзідэнт Геагр. т-ва Беларусі. Аўтар сістэмы фіз.-геагр. і геамарфал. раянавання Беларусі, прац па ландшафтах, праблемах Бел. Палесся, гісторыі геаграфіі. Удзельнічаў у складанні Атласа БССР.

Тв.: Прырода Беларусі: (Фізіка-геагр. агляд). Мн., 1959 (разам з А.Х.Шклярам, В.П.Якушка); Система физико-географических районов Белоруссии // Физическая и экономическая география. Мн., 1960; География Белоруссии. 2 изд. Мн., 1977 (у сааўт.).

В.А.Дзяменцьеў.

дзена» (1981), «Ветразі майго дзяцінства» (1982), «Развітальныя гастролі» і «Слава богу, не ў Амерыцы» (1992), «Тутэйшыя» (1993) і інш., а таксама тэлевізійных «Гора баяцца — шчасця не бачыць» (1974) і «Нас выбраў час» (3, 4, 5-я серыі, 1979).

ДЗЯМЕ́СТВЕННЫ СПЕЎ, дзямества, аднагалосы спеў у правасл. царкве. Найб. ранняе ўпамінанне датуецца 1441 (Васкрасенскі летапіс), у пеўчых кнігах — канцом 15 — пач. 16 ст. З 16 ст. пашыраны ў Ноўгарадзе, на Беларусі і Украіне. Напачатку спеў запісвалі стаўповай натацыяй, у сярэдзіне 16 ст. выпрацаваны арыгінальны тып безлінейнай дзяместваннай натацыі (камбінацыя знакаў стаўповага і пуцявога знамені; гл. *Крукі*). У наш час выпрацаваны ўстойлівыя пісьмовыя і пеўчая традыцыі Дз.с. Яго характэрныя прыкметы: адсутнасць тайназамкнёнасці ў графічных і рытмічных варыянтах;

А.Дзямарын. Дыспут. Паводле рамана І.С.Тургенева «Бацькі і дзеці». Серыя «На сюжэты з рускай класікі». 1988. Каляровая аўталітаграфія.

ДЗЯМЕ́НЦЬЕЎ Уладзімір Андрэевіч (н. 27.12.1928, г. Новаўкраінка, Украіна), бел. мастак кіно. Засл. дз. маст. Беларусі (1979). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1962). Працуе на кінастудыі «Беларусьфільм». Мастак-пастаноўшчык маст. фільмаў «Вуліца малодшага сына» (1962, з У.Белавусавым), «Трэцяя ракета» (1963), «Праз могілкі» (1965, абодва з Я.Ігнацьевым), «Іван Макаравіч» (1968, Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1970), «Я, Францыск Скарына» (1970), «Бацька» (1972), «Братушка» (1976, з Л.Трапковым), «Трэцяга не да-

непадпарадкаванасць сістэме *асмагласся*; больш свабодны падыход да патрабаванняў тэксту, падпарадкаванне яго мелодыі; мелізматычны тып спеву; адсутнасць уніфікацыі яго спісаў; адыход ад строгіх канонаў *знаменнага спеву*; шматварыянтнасць графікі і рытмікі. У богаслужэнні Дз.с. выкарыстоўваюць толькі ва ўрачыстых выпадках (найб. важныя песнапенні ўсяночнай і літургіі, велічанне, асвячэнне храмаў, вянчанне і інш.). Раней абмежаваны рэпертуар Дз.с. ў 18 ст. ўзбагаціўся, пашырылася аднагалосая дзяместваннай натацыя (па расшыфроўцы дзяместваннай натацыі позняга перыяду існуюць азбукі 2-й пал. 18 — 19 ст., даследаванні Г. Пажыдаевай, С.Фралова і інш.). Стараж. бел. дзяместваннія манодыі змешчаны ў Супрасльскім ірмалоі 1598—1601 (каля 30 песнапенняў з усяночнага няспання, літургій Раней асвячоных дароў і Васіля Вялікага, велікодных свят; некат. ўзоры выкладзены ў некалькіх напевах). *Л.П.Касюкавец.*

ДЗЯМЕ́ЦКІ Анатоль Мар'янавіч (н. 15.10.1921, в. Юркаўцы Вінніцкай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне хірургіі і тапаграфічнай анатоміі. Д-р мед. н. (1970), праф. (1971). Скончыў Харкаўскі мед. ін-т (1952). З 1953 у Віцебскім мед. ін-це. Навук. працы па даследаванні стану артэрый пры востры прамянёвай хваробе і стану век пры аперацыях на артэрыях; па метадах рэаграфіі для дыферэнцыяльнай дыягностыкі сасудзістых пашкоджанняў ніжніх канечнасцей, выкарыстанні магнітных палёў у медыцыне.

Тв.: Магнитные поля в здравоохранении. Самара, 1991 (разам з Б.Н.Жукавым і А.У.Цацоха); Лечение термических ожогов. Ростов н/Д, 1992 (у сааўт.).

ДЗЯМЕ́ШКА Аляксандр Сяргеевіч (н. 24.4.1947, г. Брэст), бел. эстрадны артыст, выканаўца на ўдарных інструментах. Засл. арт. Беларусі (1979). Вучыўся ў Брэсцкім муз. вучылішчы (1964—66). У 1969—88 ударнік вак.-інстр. ансамбля «*Песняры*», выконваў адказныя сола як ударнік (у т.л. ў нар. песнях «Забалела ты, мая галованька», «Чарачка мая», «Галава — два вухі») і як вакаліст. З 1989 у Маскве ў артыстычных калектывах (у т.л. «Песня»), з 1997 нам. начальніка канцэртнага аддзела акц. т-ва «Лужнікі».

ДЗЯМІ́ДАВА Ала Сяргееўна (н. 29.9.1936, Масква), руская актрыса. Нар. арт. Расіі (1984). Скончыла Маскоўскі ун-т (1960), Тэатр. вучылішча імя Шчукіна (1964). Працавала ў Маск. т-ры драмы і камедыі на Таганцы (да 1991). Яе мастацтва вызначаюць інтэлектуальнасць, эмац. насычанасць пры знешняй стрыманасці і строгасці: Гертруда («Гамлет» У.Шэкспіра), Ранеўская («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Федра («Федра» М.Цвятаевай) і інш. У кіно з 1957: «Дзённыя зоркі», «Іду да цябе», «Люстэрка», «Шчыт і меч», «Уцёкі містэра Мак-Кінлі» (Дзярж. прэмія СССР 1977), «Шклянка вады» (тэлевізійны) і інш. Стваральнік (1991) і кіраўнік прыватнага т-ра «А.».

ДЗЯМІ́ДАВІЧЫ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Сураў. Цэнтр сельсавета. За 15 км на У ад Касцюковіч, 175 км ад Магілёва, 18 км ад чыг. ст. Камунары. 304 ж., 115 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДЗЯМІ́ДАВЫ, дынастыя рас. горнапрамыслоўцаў, землеўладальнікаў, мецэна-

таў у канцы 17 — пач. 20 ст. Паходзілі з заможных сялян-кавалёў Тульскай губ. Родапачынальнік — Мікіта Дзямідавіч Антуф'еў, празваны паводле імя па бацьку Дзямідаў (5.4.1656, Тула — 28.11.1725). Вылучыўся пры Пятру I, пабудаваў першы чыгунаплавільны з-д у Туле (1696), пазней — шэраг металургічных з-даў на Урале. У 1720 атрымаў спадчыннае дваранства. Найб. значныя прадстаўнікі: Акінфій Мікітавіч (1678, Тула — 16.8.1745). Сын Мікіты Дзямідавіча. У 1725 на яго Ніжнетагільскім з-дзе пушчана першая домна — найб. ў тагачасным свеце. Да 1745 валодаў 25 чыгунаплавільнымі, жалезаапр. і меднымі з-дамі. Павел Рыгоравіч (9.1.1739 — 13.7.1821). Вучыўся ў Гётынгенскім ун-це і Фрайбергскай горнай акадэміі (Германія). Заснаваў Дзямідаўскі ліцэй у Яраслаўлі. Мікалай Мікітавіч (20.11.1773, с. Чыркавіцы Воласаўскага р-на Ленінградскай вобл. — 2.1.1829), ваен. дзеяч, дыпламат. Садзейнічаў пашырэнню вытв-сці фамільных з-даў. Павел Мікалаевіч (17.8.1798, Масква — 6.4.1840). Ганаровы чл. Пецярб. АН. Скончыў Парыжскі ліцэй Напалеона. У 1831 заснаваў Дзямідаўскія прэміі пры Пецярб. АН. Валодаў сіб. чыгунаплавільнымі з-дамі. Павел Паўлавіч (21.10.1839, г. Веймар, Германія — 29.1.1885). Скончыў Пецярб. ун-т (1860). Заснаваў першую на Урале ф-ку бесемеравання сталі. Усяго Дз. заснавалі больш за 50 з-даў, якія давалі 40% чыгуну ў Расіі.

Літ.: Старков В.В. Демидовы: Их жизнь и деятельность. М., 1993.

ДЗЯМІ́ДАЎ Васіль Аляксандравіч (12.4.1921, г. Віцебск — 10.6.1989), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Омскую ваен. авіяц. школу пілотаў (1942), Ваен.-паветр. акадэмію (1955). У Вял. Айч. вайну з сак. 1943 на Зах. і 3-м Бел. франтах. Камандзір звяна асобнага разведвальнага авіяпалка ст. лейт. Дз. вызначыўся 2.11.1944 у час палёту над Усх. Прусіяй: з падбітага самалёта паранены сфатаграфаваў паласу абароны праціўніка. За час вайны зрабіў 226 баявых вылетаў, удзельнічаў у 16 паветр. баях з варожымі знішчальнікамі. Да 1961 у Сав. Арміі.

ДЗЯМІ́ДАЎ Уладзімір Іванавіч (н. 9.5.1931, г. Рыбінск, Расія), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1991), праф. (1994). Скончыў БПІ (1961). Працаваў у розных галінах нар. гаспадаркі. З 1977 у БПА. Даследуе праблемы эканомікі навук.-тэхн. прагрэсу, кіравання інвестыцыямі, якасці прадукцыі, цэнаўтварэння, павышэння эфектыўнасці вытв-сці. Адзін з аўтараў навуч. дапаможнікаў.

Тв.: Методические основы оценки технико-экономического уровня машин и оборудования (разам з Ф.А.Дронавым) // Проблемы эффективности новой техники. Мн., 1972; Совершенствование организации основных производственных процессов // Проблемы интенсификации промышленного производства. Мн., 1974.

ДЗЯМІ́ДЧЫК Яўген Паўлавіч (н. 2.1.1925, г. Барысаў Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне анкахірургіі. Акад. АН Беларусі (1996), д-р мед. н. (1987), праф. (1988). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1957). З 1965 заг. аддзела таракальнай хірургіі Бел. НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі, з 1966 у Мінскім мед. ін-це (у 1974—96 заг. кафедры анкалогіі), адначасова з 1990 дырэктар Рэсп. навукова-практычнага цэнтра пухлін шчытападобнай залозы. Навук. працы па хірургіі стрававода, страўніка, шчытападобнай залозы. Сааўтар адкрыцця з'явы блока сінаптычнай перадачы пры ўздзеянні імпульснага магнітнага поля.

В.А.Дзямідаў.

Я.П.Дзямідчык.

Тв.: Пособие по онкологии. Мн., 1977 (разам з І.А.Петуховым); Рак щитовидной железы у детей. М., 1996 (разам з А.Ф.Цыбам, Я.Ф.Лушнікавым); A new form of RET rearrangement in thyroid carcinomas of children after the Chernobyl reactor accident (у сааўт.) // Oncogene. 1996. 13.

ДЗЯМЧУ́К Міхаіл Іванавіч (н. 28.6.1946, в. Дзевяткі Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. фізік, дзярж. дзеяч Беларусі. Чл.-кар. АН Беларусі (1986), д-р фіз.-матэм. н. (1983), праф. (1985). Засл. дз. нав. Беларусі (1996). Скончыў БДУ (1968). З 1970 у БДУ і НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ. У 1985—88 заг. аддзела навукі і навуч. устаноў ЦК КПБ. З 1988 міністр нар. адукацыі, з 1991 нам. старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. З 1994 рэктар БПА. Навук. працы па квантавай электроніцы і навук. прыладабудаванні (статыстычных метадах часавага аналізу хуткапераменных патокаў светлавога выпрамянення). Дзярж. прэмія Беларусі 1986.

Тв.: Статистический одноквантовый метод в оптико-физическом эксперименте. Мн., 1981 (разам з М.А.Івановым).

ДЗЯМ'Я́НАЎ Анатоль Дзямідавіч (25.11.1925, в. Усцінаўка Смаленскай вобл., Расія — 6.11.1972), бел. скульптар. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1961). Выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы (1963—72). Працаваў у станковай скульптуры. Сярод твораў: «Маладая калгасніца» (1962), «Маці» (1963), «Кубінец» (1964), «Паўночніца» (1965), партрэты Ф.Кастра Рус, Я.Коласа, У.І.Леніна і інш. Работам уласцівы абагульненасць пластыкі, манументальнасць вобразнага ладу.

М.І.Дзямчук.

М.Я.Дзям'янаў.

ДЗЯМ'Я́НАЎ Мікалай Якаўлевіч (27.3.1861, г. Цвер, Расія — 19.3.1938), савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1929; чл.-кар. 1924). Скончыў Маскоўскі ун-т (1886). З 1894 праф. Пятроўскай лясной і земляробчай акадэміі ў Маскве, з 1935 у Ін-це арган. хіміі АН СССР. Навук. працы па хіміі цыклічных злучэнняў. Распрацаваў агульны метад атрымання нармальных граніч-ных гліколяў, ненасычаных спіртоў і ізамерных ім аксідаў. Адкрыў ізамерызацыю аліцыклаў (расшырэнне ці звужэнне на адзін атам вугляроду) пры дэзамінаванні першасных амінаў азоцістай к-той (перагрупоўка Дз., 1903). Ленінская прэмія 1930.

ДЗЯМ'Я́НАЎЦЫ, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., на левым беразе р. Нёман. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 30 км на ПнЗ ад Дзятлава, 108 км ад Гродна, 26 км ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 185 ж., 89 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

А.Дзям'янаў. Маладая калгасніца. 1962.

ДЗЯМ'Я́НКА, рака ў Омскай і Цюменскай абл. Расіі, правы прыток р. Іртыш. Даўж. 1159 км. Пл. бас. 34,8 тыс. км^2. Бярэ пачатак у балотах Васюгання, цячэ ў нізінных лясістых берагах па Зах.-Сібірскай раўніне. Гал. прытокі: Кеўм (справа), Тэгус, Імгыт (злева). Ледастаў з кастр.—ліст. да мая. Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні 145 м^3/с. Сплаўная. Суднаходства на 221 км ад вусця.

ДЗЯМ'Я́НКІ, група археал. помнікаў (2 стаянкі канца 5 — 1-й пал. 2-га тыс. да н.э., бескурганны 3—7 ст. і курганны 6—12 ст. могільнікі, селішча 12—15 ст.) каля в. Дзям'янкі Добрушскага р-на Гомельскай вобл. На стаянках верхнедняпроўскай і сярэднедняпроўскай культур сярод знаходак крамянёвыя прылады працы, рэшткі ляпнога посуду. На бескурганным могільніку пахавальны абрад — трупаспаленне паза межамі могільніка; на курганным — трупаспаленне і трупапалажэнне галавой на З і У (адзіны некропаль *радзімічаў*, які існаваў бесперапынна ў 7—12 ст.). На селішчы прасочаны рэшткі 4—5 пабудоў. Непадалёку ад вёскі выяўлена 11 стаянак каменнага і бронзавага вякоў.

ДЗЯМ'Я́НКІ, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Іпуць. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 22 км на ПнУ ад Добруша, 50 км ад Гомеля, 10 км ад чыг. ст. Злынка. 1134 ж., 380 двароў (1997). Сярэдняя школа, дапаможная спец. школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік архітэктуры — сядзібны дом (19 ст.). Каля вёскі група археал. помнікаў *Дзям'янкі*.

ДЗЯНІ́КІН Антон Іванавіч (16.12.1872, в. Шпеталь-Дольны, Улацлаўскае ваяв., Польшча — 7.8.1947), расійскі военачальнік, адзін з кіраўнікоў *белай гвардыі*, ваен. пісьменнік. Ген.-лейтэнант (1916). Скончыў Акадэмію Генштаба (1899). Удзельнік рус.-яп. вайны 1904—05. У 1-ю сусв. вайну камандаваў стралк. брыгадай і дывізіяй, армейскім корпусам. У 1917 нач. штаба Вярх. галоўнакаманд., галоўнакаманд. Зах. і Паўд.-Зах. франтамі. У час грамадз. вайны ў Расіі адзін з гал. арганізатараў белага руху, галоўнакамандуючы добраахвотніцкай арміяй (1918—20) і ўзбр. сіламі Пд Расіі (1919—20), адначасова са студз. 1920 «вярх. правіцель Расіі». 4.4.1920 здаў камандаванне ген. П.М.Урангелю і выехаў у Вялікабрытанію. З канца 1890-х г. актыўна займаўся публіцыстыкай.

Тв.: Путь русского офицера. М., 1990; Очерки русской смуты. М., 1991.

Літ.: Лехович Д. Белые против красных: Судьба генерала Антона Деникина. М., [1992]; Гордеев Ю.Н. Генерал Деникин: Воен.-ист. очерк. М., 1993.

ДЗЯНІ́САВА, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., каля аўтадарогі Ліда—Слонім. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на ПдЗ ад Дзятлава, 135 км ад Гродна, 30 км ад чыг. ст. Слонім. 408 ж., 133 двары (1997). Дом культуры, б-ка.

ДЗЯНІ́САВІЦКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння на тэр. Крупскага р-на Мінскай вобл. Засн. ў 1979 з мэтай захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Пл. 1,3 тыс. га (1997). Уключае 4 кварталы Дзянісавіцкага і 7 кварталаў Сакаловіцкага лясніцтваў Крупскага лясгаса, а таксама ч. тарфяных балот Падбалонне і Бабнік, Рожкі, Калінаўка. Растуць хвоя, бяроза, елка, асіна, вольха, трапляюцца дуб і клён, з кусцікавых раслін — багун, верас, журавіны, брусніцы, чарніцы, з травяністых — асокі, падвей, хвошч; шмат сфагнавых імхоў.

ДЗЯНІ́САЎ Аляксандр Пятровіч (н. 5.5.1944, с. Борскае Куйбышаўскай вобл., Расія), акцёр. Засл. арт. Беларусі (1980). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1968). У 1967—90 у Бел. т-ры імя Я.Купалы. Напачатку выконваў ролі маладых герояў, потым — характарныя: Сын («Святая прастата» А.Макаёнка), Ігар («Градыцыйны збор» В.Розава), Менахэм-Мэндл («Памінальная малітва» Р.Горына паводле твораў Шолам-Алейхема). У ролі мужнага, высакароднага старшыны Дугіна («Радавыя» А.Дударава; Дзярж. прэмія СССР 1985) дасягнуў трагічнага гучання. Сярод інш. роляў: Мікола Гусоўскі («Напісанае застаецца» А.Петрашкевіча), Іван Кавалевіч («Рудабельская рэспубліка» паводле С.Грахоўскага), Марцін («Валенсіянскія вар'яты» Лопэ дэ Вэгі). З 1991 у ЗША.

ДЗЯНІ́САЎ Міхаіл Іванавіч (21.11.1900, в. Трасцянка Саратаўскай вобл., Расія — 11.1.1971), бел. спявак (лірыка-драм. барытон). Нар. арт. Беларусі (1944). Вучыўся ў Саратаўскай кансерваторыі (1925—28), оперным класе Бел. муз. тэхнікума (1928—30), Бел. студыі оперы і балета (1930—33) у А.*Баначыча*. У 1933—58 (з перапынкам, у 1941—43 у Ерэванскім оперным т-ры) саліст Дзярж. т-ра оперы і балета БССР. У 1958—64 маст. кіраўнік Бел. філармоніі, у 1964—70 выкладчык Бел. кансерваторыі. Дэбютаваў партыяй Эскамільё ў оперы «Кармэн» Ж.Бізэ (1932). Валодаў моцным прыгожым голасам, сцэн. абаяльнасцю. Створаныя ім вобразы адметныя адухоўленасцю, маст. выразнасцю, тонкім густам, пачуццём меры.

М.І.**Дзянісаў**.

Лепшыя вобразы ў нац. рэпертуары: Змітрок і Апанас («Міхась Падгорны» і «Алеся» Я.Цікоцкага), Кастусь («Кастусь Каліноўскі» Дз.Лукаса), Кузьміч («У пушчах Палесся» А.Багатырова); у класічным — Грозной («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Анегін, Ялецкі, Мазепа («Яўген Анегін», «Пікавая дама», «Мазепа» П.Чайкоўскага), Дэман («Дэман» А.Рубінштэйна), Ігар («Князь Ігар» А.Барадзіна), Траякураў («Дуброўскі» Э.Напраўніка), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Рыгалета, Жэрмон («Рыгалета», «Травіята» Дж.Вердзі), Каніо («Паяцы» Р.Леанкавала), Мечнік («Страшны двор» С.Манюшкі). У канцэртным рэпертуары значнае месца займалі бел. нар. песні, творы бел. кампазітараў.

Літ.: Пукст Р. Натхнёны спявак // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960.

Б.С.Смольскі.

М.**Дзянісаў** у ролях Дэмана (злева) і Грознога.

ДЗЯНІ́САЎ Павел Ферапонтавіч (н. 26.8.1911, г. Шахты, Расія), бел. музыкант, трубач. Засл. арт. Беларусі (1954). Вучыўся ў Маскоўскай кансерваторыі (1935—38). З 1938 у аркестры Свярдлоўскага т-ра оперы і балета. У 1944—67 першы трубач і канцэртмайстар групы труб Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Вёў клас трубы ў Бел. кансерваторыі (1944—69) і Мінскім муз. тэхнікуме (1944—65). Кіраўнік самадз. духавых аркестраў у Мінску (1970—75) і Маскве (1976).

ДЗЯНІ́САЎ Эдзісон Васілевіч (6.4.1929, г. Томск, Расія — 23.11.1996), расійскі кампазітар, педагог. Засл. дз. маст. Расіі (1990). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1956, клас кампазіцыі В.*Шабаліна*), з 1958 выкладаў у ёй (праф. з 1993). У творчасці дамагаўся сінтэзу сучасных сродкаў кампазіцыйнай тэхнікі (свабоднай серыйнасці, *алеаторыкі*) і муз. стылістыкі мінулага. Сярод твораў: оперы «Пена дзён» (1981, паст. 1986), «Чатыры дзяўчыны» (1986), балет «Споведзь» (паст. 1984); вак.-інстр. творы, у т.л. Рэквіем (1980); сімфоніі (1982, 1987); «Свеце ціхі» для хору а капэла (1988); творы для інструментаў з аркестрам, у т.л. 10 канцэртаў (1972—86); камерна-інстр. і вак. творы, музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Аўтар кн. «Ударныя інструменты ў сучасным аркестры» (1982), «Сучасная музыка і праблемы эвалюцыі кампазітарскай тэхнікі» (1986). Старшыня Асацыяцыі сучаснай музыкі (Масква, з 1990).

ДЗЯНІ́СКАВІЧЫ, вёска ў Ганцавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на У ад горада і 23 км ад чыг. ст. Ганцавічы. 271 км ад Брэста. 1817 ж., 887 двароў (1997). Лясніцтва. Меліярац. ўпраўленне асушальна-арашальных сістэм. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Царква.

«ДЗЯННІ́ЦА», грамадская і літ. газета. Выдавалася з 14.11.1916 да 13.1.1917 у Петраградзе штодзённа на бел. мове. Рэдактар-выдавец З.Х.Жылуновіч (Ц.Гартны). Асвятляла гіст. мінулае, культ. здабыткі Беларусі, эканам. і паліт. становішча ў 1-ю сусв. вайну. Выступала за права народаў нац. меншасцей Расіі на свабоду і самастойнасць, за развіццё нац. культуры, асветы, друку. Адстойвала правы бел. народа на нац. адраджэнне, навучанне на роднай мове, заснаванне нац. навуч. устаноў (арт. Ц.Гартнага «Аб беларускім універсітэце», «Яшчэ раз аб беларускім універсітэце»), выступала за ўнармаванне бел. правапісу (нарыс Э.Будзькі «Думкі да граматыкі»). Змяшчала маст. і публіцыстычныя творы Ц.Гартнага, К.Буйло, М.Гарэцкага, Я.Дылы, А.Паўловіча, Х.Чарнышэвіча, Ф.Шантыра і інш. Спыніла існаванне з-за фінансавых і цэнзурных цяжкасцей. Выйшла 7 нумароў. *С.В.Говін.*

«ДЗЯННІ́ЦА», грамадска-паліт. і літ. газета. Выдавалася з 1.3.1918 у Петраградзе, з 6.4.1918 да 24.2.1919 у Маскве штотыднёва на бел. мове. Орган *Беларускага нацыянальнага камісарыята* (Белнацкома); з 3.12.1918 выходзіла як веснік Белнацкома і Маскоўскай бел. секцыі РКП(б). Асвятляла дзейнасць Белнацкома і яго аддзяленняў у Петраградзе, Смаленску і Віцебску, *Беларускага навукова-культурнага таварыства* ў Маскве, бел. згуртаванняў і ўстаноў у Расіі. Змяшчала інфарм. матэрыялы пра падзеі ў Расіі, эканам. становішча бел. народа на акупіраванай тэрыторыі, дакументы пра дзейнасць урада БНР, артыкулы па праблемах нац. адраджэння, прапагандавала ідэі саюза БССР і РСФСР, умацавання сав. улады. З паліт. публікацыямі выступалі Ц.Гартны, І.Дварчанін і інш. Змяшчала маст. творы Я.Коласа, Гартнага, М. і Г.Гарэцкіх, Я.Дылы, Дварчаніна, Я.Нёманскага і інш. Выйшла 49 нумароў.

Літ.: Александровіч С.Х. Першая беларуская савецкая // Александровіч С.Х. Гісторыя і сучаснасць. Мн., 1968. *С.В.Говін.*

ДЗЯНШЧЫ́К, 1) у мінулыя часы ў шэрагу армій (герм., аўстра-венг., італьян., франц., рас. і інш.) салдат (матрос), які знаходзіўся пры генерале, адмірале, афіцэру або ваен. чыноўніку ў якасці прыслугі. У Расіі Дз. з'явіліся пры цару Міхаіле Фёдаравічу і прызначаліся для выканання розных даручэнняў на адзін дзень (адсюль назва); з канца 17 ст. пастаянная прыслуга. На караблях рас. ВМФ абавязкі Дз. фактычна выконваў *веставы*. 2) Афіцэр світы Пятра I, які выконваў яго асобыя даручэнні.

ДЗЯРА́ЖНЯ, Дзяражанка, рака ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім р-нах Магілёўскай вобл., правы прыток р. Беседзь (бас. Дняпра). Даўж. 54 км. Пл. вадазбору 312 км^2. Пачынаецца за 1 км на Пн ад в. Дзяражня Клімавіцкага р-на. Цячэ па паўд.-ўсх. ускраіне Аршанска-Магілёўскай раўніны. Даліна ў верхнім цячэнні невыразная, месцамі забалочаная, ніжэй трапецападобная шыр. да 2 км, адкрытая, лугавая. Рэчышча ад вытоку на працягу 8,3 км каналізаванае, ніжэй звілістае.

ДЗЯРА́ЧКА, расліна, гл. ў арт. *Маруна.*

ДЗЯРГА́Й Сяргей Сцяпанавіч (17.9.1907, Мінск — 25.12.1980), бел. паэт. Скончыў Мінскую чыг. школу (1924) і агульнаадук. курсы (1927). Удзельнік падполля і партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. У 1930-я г. працаваў у газ. «Звязда», з 1951 у час. «Полымя», у 1953—67 у час. «Вожык». Друкаваўся з 1938. Першы зб. «Вачыма будучыні» (1953). Гал. тэмы яго паэзіі (зб-кі «Крэмень аб крэмень», 1958, «Чатыры стыхіі», 1962, Літ. прэмія імя Я.Купалы 1964, «Свята ў будзень», 1964) — любоў да роднага краю, неаслабная ўвага да чалавека, клопат пра яго самаўдасканаленне, засяроджанасць на складаных праблемах часу, зварот да подзвігу бел. народа ў Вял. Айч. вайну. Дз. горача цікавіўся гіст. мінулым свайго народа (паэмы «Напрадвесні», 1960, «Над спакоем крыніц», 1962), паказваў пераўтварэнне чалавекам зямлі («Песня пра Туркменскі канал», 1951), ствараў гіст. эпас («Пушкін на шашы Энтузіястаў», 1953). Выкарыстанне разнастайных паэт. сродкаў і формаў, умелае валоданне фальклорна-песенным вершам, сучасным верлібрам, філасафічнасць, асацыятыўнасць мыслення, культура творчасці, руплівыя адносіны да роднай мовы зрабілі яго паэзію адметнай у бел. л-ры. Гумарыстычныя творы Дз. ў яго зб-ках «Цешча» (1959), «Салата з дзядоўніку» (1967). На бел. мову перакладаў паэмы «Гражына» А.Міцкевіча, «Бацька зачумленых» Ю.Славацкага, «Дванаццаць» А.Блока, «На ўвесь голас» У.Маякоўскага, «Сінія гусары» М.Асеева, «Сын» П.Антакольскага, «1905 год» Б.Пастарнака, асобныя творы Э.Багрыцкага, У.Бранеўскага, В.Брусава, У.Лугаўскога, Я.Райніса, М.Рыльскага, П.Тычыны і інш.

Тв.: Выбранае. Мн., 1967; Вершы. Мн., 1974; На вогненнай сцяжыне. Мн., 1977; Чатыры стыхіі. Мн., 1988.

Літ.: Арочка М. Сатырычная паэзія // Сучасная беларуская паэзія. Мн., 1970; Бярозкін Р. Пошук сапраўднага // Бярозкін Р. Постаці. Мн., 1971; Гілевіч Н. Словы трывалыя, прачулыя, разумныя // Гілевіч Н. У гэта веру. Мн., 1978; Лойка А. Зайдзі ў мой дом // Лойка А. Паэзія і час. Мн., 1981;

С.С.Дзяргай.

Гніламёдаў У. Сучасная беларуская паэзія. Мн., 1983. С. 223—227; Сачанка Б. Круты стол Сяргея Дзяргая // Сачанка Б. Жывое жыццё. Мн., 1985; Сіпакоў Я. Сяргей Сцяпанавіч // Сіпакоў Я. Журба ў стылі рэтра. Мн., 1990. *Я.Сіпакоў.*

ДЗЯРЖА́ВА, асноўны інстытут сістэмы грамадства, які з'яўляецца гал. сродкам паліт. улады, арганізоўвае, накіроўвае і кантралюе сумесную дзейнасць і ўзаемаадносіны людзей, сац. суполак, слаёў, класаў і асацыяцый. Першапачаткова азначала супольнасць людзей, якія жывуць на пэўнай тэрыторыі, аб'ядноўваюцца і кіруюцца органамі ўлады, утворанымі з мэтай абароны жыцця, свабоды і маёмасці грамадзян, забеспячэння дзярж. суверэнітэту краіны. У такім сэнсе Дз. трактавалася да 17 ст., калі Н.Макіявелі, Т.Гобс, Дж.Лок, Ж.Ж.Русо абгрунтавалі дакладную размежаванасць Дз. і грамадства.

Асн. адзнакі Дз.: адасабленне публічнай улады ад грамадства, яе несупа-

дзенне з арганізацыяй усяго насельніцтва, з'яўленне слоя прафес. кіраўнікоў; наяўнасць пэўнай тэрыторыі, суверэнітэту, г. зн. вярхоўнай улады над пэўнай тэрыторыяй, якая мае права выдаваць законы і ўтвараць нормы, абавязковыя для ўсяго насельніцтва; функцыянаванне асобай сістэмы органаў і ўстаноў, што складаюць механізм Дз., спецыфічнае месца ў якім займаюць праваахоўныя ін-ты (суд, пракуратура, а таксама армія, міліцыя і інш.); наяўнасць права, г. зн. абавязковых правіл паводзін, якія ўстанаўліваюцца і санкцыянуюцца, кантралююцца Дз.; існаванне падаткаў, якія неабходны для матэрыяльнага забеспячэння дзярж. палітыкі: эканам., сац., абароннай і інш.; абавязковасць членства ў Дз., *грамадзянства*, якое чалавек атрымлівае з моманту нараджэння ці па адпаведнай просьбе (у выніку эміграцыі і інш.).

Істотнае значэнне мае тыпалогія Дз. з пункту гледжання класавай прыроды дзярж. улады (якому сац. класу яна служыць). Існуе падзел (гал. чынам у марксісцка-ленінскай тэорыі) на рабаўладальніцкую, феад., бурж., пралетарскую Дз. Паводле формы праўлення адрозніваюць Дз. манархічную (абсалютную ў Саудаўскай Аравіі, Амане ці канстытуцыйную ў Англіі, Швецыі, Іспаніі) і рэспубліканскую (прэзідэнцкую ў ЗША, Расіі, Беларусі, Францыі і інш. ці парламенцкую ў Германіі, Ізраілі, Турцыі і інш.); паводле формы дзярж. ўладкавання — унітарную (Беларусь), канфедэратыўную (Швейцарыя), федэратыўную (Расія, ЗША, Мексіка); паводле паліт. рэжыму — дэмакратычную, аўтарытарную, таталітарную.

У сучасным грамадстве шырока абмяркоўваюцца праблемы станаўлення і развіцця прававой і сацыяльнай Дз. Для прававой Дз. характэрны: наяўнасць грамадз. супольнасці; абарона правоў і свабод асобы, грамадз. парадку, стварэнне прававых умоў для госп. дзейнасці ўсім яе суб'ектам; прававая роўнасць усіх грамадзян, прыярытэт правоў чалавека над законамі Дз.; усеагульнасць права, яго распаўсюджанне на ўсіх грамадзян, усе арганізацыі і ўстановы, у т.л. і органы дзярж. улады; раздзяленне заканадаўчай, выканаўчай і судовай улад; суверэнітэт народа як канчатковага вытоку ўлады, падначаленасць яму дзярж. суверэнітэту. Сацыяльная Дз. — гэта такі сац.-паліт. ін-т, які забяспечвае кожнаму грамадзяніну дастойныя ўмовы існавання, сац. абароненасці, аднолькавыя магчымасці для самарэалізацыі кожнага чалавека ў грамадстве, саўдзельніцтва ў кіраванні выт-сцю і інш. сферамі грамадскага жыцця, у т.л. палітычнага.

На тэр. Беларусі першыя дзярж. ўтварэнні існавалі ў 9—13 ст. у выглядзе буйных княстваў — Полацкага, Тураўскага, Мінскага (Менскага), Гродзенскага (Гарадзенскага), Навагрудскага (гл. адпаведныя арт.). Далейшае развіццё дзяржаўнасць набыла ў *Вялікім княстве Літоўскім*. У 1569 ВКЛ уступіла ў канфедэратыўны саюз з Польшчай і стварыла разам з ёй адзіную Дз. *Рэч Паспалітую*. У выніку 3 падзелаў Рэчы Паспалітай землі Беларусі былі далучаны да Расійскай імперыі. Адраджэнне бел. дзяржаўнасці адбылося ў пач. 20 ст. з абвяшчэннем *Беларускай Народнай Рэспублікі* (25.3.1918) і ўтварэннем *Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* (1.1.1919). 27.7.1990 прынята Дэкларацыя аб дзярж. суверэнітэце БССР. На сесіі Вярхоўнага Савета БССР 19.9.1991 зацверджана назва Дз. — Рэспубліка Беларусь. Паводле новай рэдакцыі Канстытуцыі 1994, зацверджанай рэферэндумам 1996, Рэспубліка Беларусь з'яўляецца унітарнай дэмакр. сацыяльна-прававой Дз.

Літ.: Доўнар-Запольскі М.В. Основы Дзяржаўнасьці Беларусі. Мн., 1994; Пугачев В.П., Соловьев А.И. Введение в политологию. 3 изд. М., 1997; Матусевич А.В. Политическая система: Состояние и развитие. Кн. 1. Мн., 1992; Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.
Я.М.Бабосаў.

ДЗЯРЖА́ВА, дзяржаўнае зямельнае ўладанне ў ВКЛ, якое знаходзілася ў распараджэнні пэўнай асобы — *дзяржаўцы* — на вызначаных умовах трымання. У 15—16 ст. мелі розную велічыню, некат. з іх ператварыліся ў *староствы*. У 17—18 ст. Дз. складаліся з адной ці некалькіх вёсак або нават іх частак, часам пад Дз. лічылася пэўная колькасць зямлі, на якой не было аселых сялян.


Г.Р.Дзяржавін.

ДЗЯРЖА́ВІН Гаўрыла Раманавіч (14.7.1743, в. Кармачы ці в. Сакуры Лашаўскага р-на, Татарстан — 20.7.1816), рускі паэт. Вучыўся ў Казанскай гімназіі (1759—62). Друкаваўся з 1773. З пазіцый асветнага абсалютызму ўслаўляў веліч і дзярж. моц Расіі, рус. палкаводцаў, гераізм салдат (оды «На ўзяцце Ізмаіла», «На пераход Альпійскіх гор»). Выказваў спачуванне народу, выкрываў злоўжыванні царскай адміністрацыі, саноўных вяльможаў (оды «Феліца», 1783, «Уладарам і суддзям», 3-я рэд. 1787, «Вяльможа», 1798). У вершах — аўтабіяграфізм, канкрэтнасць і пластычнасць вобразаў, быт. і пейзажныя замалёўкі (оды «На смерць князя Мяшчэрскага», 1779, «Бог», 1784, «Вадаспад», 1798). Дыяпазон оды пашырыў ад дыфірамба да песні, спалучаў у адным творы элементы оды і сатыры, філас. роздумы і асабістыя прызнанні («Ручай», «Ластаўка», «Яўтену. Жыццё званскае»). У 1790-я г. пераважала анакрэантычная лірыка (зб. «Анакрэантычныя песні», 1801). У апошнія гады жыцця звяртаўся да драматургіі. Паэзія Дз. — пераходная ступень у развіцці рус. л-ры ад класіцызму М.Ламаносава да рэалізму А.Пушкіна. У 1793—94, 1799 і 1800 быў на Беларусі (Віцебск, Шклоў, Лёзна).

Тв.: Стихотворения. Л., 1981; Оды. Л., 1985.
Літ.: Ходасевич В.Ф. Державин. М., 1988.
Л.Л.Кароткая.

ДЗЯРЖА́ВІН Мікалай Севасцьянавіч (15.12.1877, в. Прэслаў Запарожскай вобл., Украіна — 26.2.1953), савецкі славяназнавец-філолаг, гісторык, грамадскі дзеяч. Акад. АН СССР (1931), ганаровы чл. АН БССР, Балгарскай АН. Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це (1896—97), Нежынскім гіст.-філал. ін-це (1897—1900). Рэктар (1922—25), пасля заг. кафедры (1925—53) слав. філалогіі Ленінградскага ун-та. У 1931—34 дырэктар Ін-та славяназнаўства АН СССР (Ленінград), у 1947—53 кіраўнік ленінградскага аддзялення Ін-та славяназнаўства. Аўтар больш як 500 прац пераважна па балг. л-ры і гісторыі Балгарыі, а таксама этыялогіі славян, гісторыі рус. л-ры, школы і выкладання. Дзярж. прэмія СССР (1948).

Тв.: Происхождение русского народа. М., 1944; Славяне в древности. М., 1946; История Болгарии. Т. 1—4. М.; Л., 1948.

ДЗЯРЖА́ВІН Уладзімір Васілевіч (14.11.1908, в. Нерахта Кастрамской вобл., Расія — 5.10.1975), рус. паэт і перакладчык. Друкаваўся з 1934. Аўтар зб. «Вершы» (1936). Перакладаў класічную паэзію Усходу. На рус. мову пераклаў паасобныя творы Я.Коласа, М.Багдановіча, вершы і паэму П.Броўкі (зб. «Думы пра Маскву», 1947). Пераклады вызначаюцца высокім паэт. майстэрствам, дакладнасцю і выразнасцю.

ДЗЯРЖА́ЎНАЕ АБ'ЯДНА́ННЕ «БЕЛКАНЦЭ́РТ». Створана ў 1992 у Мінску ў выніку рэарганізацыі канцэртна-гастрольнага аб'яднання «Мінсканцэрт» (да 1990 наз. *Белдзяржэстрада*) як Рэсп. дырэкцыя эстрадна-цыркавога мастацтва; з 1996 сучасная назва. Маст. кіраўнік В.*Вуячыч*. У складзе «Белканцэрта» (1997): творчыя аб'яднанні фестываляў і конкурсаў, «Студыя «*Сябры*», «*Верасы*»; маладзёжны т-р эстрады, цыркавыя калектывы «Беларусь», «Мінчане», «Паяцы», вак.-інстр. група пад кіраўніцтвам У.Ухцінскага, вак.-інстр. ансамбль «Карусель», вак. ансамбль «Славяне»; эстрадна-харэаграфічны ансамбль «*Чараўніцы*», харэаграфічныя групы «Сэнс», «Фіеста», танц. ансамбль «Архідэя», цыганскі фалькл. ансамбль «Гіля-Рамэн»; лялечны т-р «Лялькі і акцёры», дзіцячы вак. ансамбль «Званочкі», вял. група салістаў-вакалістаў.
А.А.Літвіновіч.

ДЗЯРЖА́ЎНАЕ ВЫДАВЕ́ЦТВА БССР, назва выдавецтва «*Беларусь*» у 1921—63.

ДЗЯРЖА́ЎНАЕ ПАЛІТЫ́ЧНАЕ ЎПРАЎЛЕ́ННЕ БССР (ДПУ БССР), спецслужба, дзярж. орган, надзелены

правам аператыўна-вышуковай дзейнасці. Існавала ў 1922—34. Утворана пры ЦВК БССР паводле рашэння яго Прэзідыума ад 1.3.1922 на базе скасаванай Надзвычайнай камісіі БССР. У адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1927 ДПУ уваходзіла ў СНК рэспублікі. На ДПУ БССР ускладаліся задачы: барацьба з падрыўной дзейнасцю імперыял. разведак і замежных антысав. цэнтраў; прадухіленне і падаўленне адкрытых контррэв. выступленняў (паліт. і эканамічных); барацьба з бандытызмам і ўзбр. паўстаннямі; выяўленне контррэв. арг-цый і асоб, дзейнасць якіх накіравана на падрыў гасп. жыцця; ахова дзярж. тайнаў і барацьба са шпіянажам; ахова шляхоў зносін, барацьба з крадзяжом грузаў; ахова граніц, барацьба з эканам. і паліт. кантрабандай і незаконным пераходам граніцы; выкананне спец. заданняў ЦВК і СНК БССР па ахове рэв. парадку. У 1922 ДПУ БССР дзейнічала на аснове палажэнняў аб ДПУ РСФСР, яго мясц. органаў, асобых і трансп. аддзелаў, з 1923 на аснове палажэння аб АДПУ СССР і яго органах. У аператыўнай дзейнасці кіравалася загадамі і распараджэннямі ДПУ РСФСР, З 1923 — АДПУ СССР.

Органы ДПУ БССР былі эфектыўна дзейным інструментам паліт. улады, якая існавала ў БССР, як і ў СССР у цэлым. Пасля грамадз. вайны яны зрабілі істотны ўклад у стабілізацыю ўнутрыпаліт. становішча ў БССР. У 1-й пал. 1920-х г. займаліся барацьбой з узбр. антысав. атрадамі і групамі (Булак-Балаховіча, Паўлоўскага, Моніча, Караткевіча, Багулевіча і інш.), якія прарываліся з тэр. Зах. Беларусі, што адышла да Польшчы. Да сярэдзіны 1920-х г. была наладжана надзейная ахова бел. ўчастка зах. граніцы СССР, створана сістэма процідзеяння разведвальна-падрыўной дзейнасці спецслужбаў зах. дзяржаў і замежных антысав. цэнтраў і арг-цый. Супрацоўнікі ДПУ БССР удзельнічалі ў шэрагу разведвальных і контрразведвальных аперацый, якія праводзіла АДПУ (напр., вывад на сав. тэрыторыю і арышт у Мінску ў жн. 1924 Б.В.*Савінкава*). У сувязі з узмацненнем у канцы 1920-х г. тэндэнцыі да далейшай цэнтралізацыі ўсіх бакоў жыцця ў СССР, адсутнасцю дастатковай прававой базы дзейнасці спецслужбаў органы ДПУ усё больш ператвараліся ў простых выканаўцаў патрабаванняў саюзнага цэнтра. ДПУ БССР удзельнічала ў выцясненні, а пазней і знішчэнні паліт. і ідэйнай апазіцыі, нанясенні незаменных страт сялянству ў ходзе калектывізацыі, барацьбе з бел. нац.-дэмакр. рухам, праследаванні дзеячаў нац. культуры. У канцы 1920 — пач. 1930-х г. кіраўніцтва ДПУ «выкрыла» шэраг «контррэвалюцыйных арганізацый»: «*Саюз вызвалення Беларусі*», «*Беларускі філіял Працоўнай сялянскай партыі*», «*Беларуская народная грамада*», «*Беларускі нацыянальны цэнтр*», «шкоднікаў» у Наркамземе, Трактарацэнтры і інш. Паводле пастановы ЦВК БССР ад 15.7.1934 ДПУ пераўтворана ва Упраўленне дзяржбяспекі НКУС БССР. *А.А.Тозік.*

ДЗЯРЖА́ЎНАЕ ПРА́ВА, сукупнасць прававых нормаў, якія рэгламентуюць асновы дзярж. і грамадскага ладу краіны, сістэму і прынцыпы фарміравання і дзейнасці органаў дзярж. улады і кіравання, выбарчую сістэму, правы і абавязкі грамадзян. У некат. замежных краінах тэрмін Дз.п. замяняецца тэрмінам канстытуцыйнае права.

У Рэспубліцы Беларусь гал. крыніца Дз.п. — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, а таксама заканадаўства аб выбарах, інш. прававыя акты. Нормы Дз.п. вызначаюць паліт. і эканам. сістэму грамадства, асновы дзейнасці дзяржавы ў галіне сац. развіцця і культуры, знешняй палітыкі і абароны Айчыны, рэгулююць узаемаадносіны дзяржавы і асобы, устанаўліваюць таксама сістэму, парадак утварэння і прынцыпы дзеяння органаў заканадаўчай, выканаўчай і суд. улады, органаў мясц. кіравання і самакіравання, фінансава-крэдытнай сістэмы, пракуратуры, дзярж. кантролю. Вызначальнае месца ў сістэме Дз.п. належаць нормам, якія замацоўваюць канстытуцыйныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян, гарантуюць абарону гэтых правоў і свабод. Дз.п. як вядучая галіна з'яўляецца асноватворнай для інш. галін права — цывільнага, прац., адм. і інш.

Існуе і навука Дз.п., якая вывучае дзяржаўна-прававыя нормы, інстытуты і адносіны ў працэсе іх узнікнення і развіцця, даследуе прыроду, сутнасць і змест Дз.п., яго прынцыпы, прадмет, крыніцы і сістэму. *С.У.Скаруліс.*

ДЗЯРЖА́ЎНАЕ ПРАДПРЫЕ́МСТВА (АБ'ЯДНА́ННЕ), адно са структурных падраздзяленняў нар.-гасп. комплексу ў Рэспубліцы Беларусь і некат. інш. краінах. З'яўляецца адносна адасобленым прадпрыемствам; сваю дзейнасць ажыццяўляе на аснове поўнага гасп. разліку, самакіравання і самафінансавання; мае статус юрыд. асобы і распараджаецца сваёй мат.-тэхн. базай. Гл. таксама *Прадпрыемства*.

ДЗЯРЖА́ЎНАЕ РЭГУЛЯВА́ННЕ, форма ўздзеяння дзяржавы на функцыянаванне эканам. сістэмы, галін нар. гаспадаркі з мэтай падтрымання сваёй палітыкі, змянення ў пэўным кірунку эканам. працэсаў, з'яў або сувязей паміж імі. Выкарыстоўваецца для ўздзеяння на рыначную кан'юнктуру, працэс рыначнага цэнаўтварэння. Дз.р. цэн можа ажыццяўляцца прамым (ліміраванне цэн ці іх субсідзіраванне са сродкаў дзярж. бюджэту) і ўскосным (дыферэнцыраваная падатковая і крэдытная палітыка, фінансаванне н.-д. работ, дзяржзаказы прыватным кампаніям і інш.) метадамі.

ДЗЯРЖА́ЎНАЕ ХАРЭАГРАФІ́ЧНАЕ ВУЧЫ́ЛІШЧА РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, назва ў 1992—96 *Дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа Рэспублікі Беларусь.*

ДЗЯРЖА́ЎНА-МАНАПАЛІСТЫ́ЧНЫ КАПІТАЛІ́ЗМ, гл. ў арт. *Капіталізм.*

ДЗЯРЖА́ЎНАСЦЬ, 1) асаблівая прыкмета гіст. развіцця краін (нацый, саюзаў плямён і інш. утварэнняў), якія змаглі стварыць уласную дзяржаву. Існуе шэраг сімвалічных прыкмет аўтаномнай Дз. — выкарыстанне афіц. дзярж. мовы, дзярж. сімволікі (*герб, гімн, сцяг*), наяўнасць пэўнай сістэмы органаў улады (дзярж. апарату), формы праўлення (манархія, парламенцкая рэспубліка, прэзідэнцкая рэспубліка), формы тэр. ўладкавання (унітарная дзяржава, федэрацыя, канфедэрацыя), формы паліт. рэжыму (дэмакр., аўтарытарны, ваенны, грамадзянскі, тэакратычны і інш.). Нац. Дз. выражае рэальную здольнасць увасабляць і абараняць *суверэнітэт* нацыі або іншага этнасу, выкарыстоўваць паліт. ўладу для ўмацавання дэмакратыі і росту дабрабыту народа, развіцця яго культуры і мовы, абароны правоў і свабод чалавека, законных інтарэсаў прадстаўнікоў нац. меншасцей і ўсіх жыхароў дадзенага нац.-тэр. ўтварэння. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, зыходзячы з неад'емнага права народа на самавызначэнне і абапіраючыся на шматлікую гісторыю развіцця бел. дзяржаўнасці, замацоўвае статус краіны як унітарнай дэмакр. сац. прававой дзяржавы, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самаст. ажыццяўляе ўнутр. і знешнюю палітыку, абараняе сваю незалежнасць і тэр. цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак (гл. таксама *Дзяржава*). 2) Уласцівасць улады, яе палітыкі, якая выражае іх сілу, незалежнасць, магутнасць і здольнасць аказваць уплыў на развіццё падзей у свеце. Вызначаецца паліт., эканам. і духоўна-ідэалаг. аўтарытэтам краіны ў свеце або рэгіёне, яе маштабам і колькасцю насельніцтва, характарам і ўздзеяннем яе палітыкі і інш. фактарамі. Абсалютызацыя гэтых прынцыпаў і ўяўленні аб выключнасці і асаблівай ролі сваёй краіны, нацыі на практыцы прыводзяць да вялікадзяржаўнасці, ігнаравання волі і інтарэсаў іншых краін і народаў, знешняй экспансіі (гл. *Нацыяналізм, Шавінізм*). *С.Ф.Дубянецкі.*

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ АКАДЭМІ́ЧНАЯ СІМФАНІ́ЧНАЯ КАПЭ́ЛА РАСІІ. Створана ў 1991 у Маскве ў выніку зліцця Дзярж. камернага хору СССР (існаваў з 1971) і Дзярж. сімфанічнага аркестра Мін-ва культуры СССР (існаваў з 1957). Маст. кіраўнік і гал. дырыжор капэлы В.Пальянскі. Капэла ўяўляе сабой арган. адзінства двух муз. арганізмаў, якія захоўваюць пэўную творчую самастойнасць (маюць уласныя канцэртныя праграмы, гастрольныя планы, здзяйсняюць запісы). Дзякуючы асаблівай сінт. структуры калектыў мае магчы-

масць выконваць узоры класічнай музыкі — месы і араторыі, рэквіемы і кантаты, прызначаныя для выканання салістамі, хорам і аркестрам, у т.л. «Глорыя» А.Вівальдзі, «Месія» Г.Ф.Гендэля, месы В.А.Моцарта і Ф.Шуберта, рэквіемы Л.Керубіні, Дж.Вердзі, Моцарта, І.Брамса, А.Брукнера, «Званы» С.Рахманінава, «Вяселейка» І.Стравінскага, многія оперы ў канцэртным выкананні. Капэла — першы выканаўца многіх твораў А.Шнітке, М.Сідзельнікава, С.Губайдулінай і інш. Выступленням капэлы ўласцівыя глыбіня інтэрпрэтатарскіх канцэпцый, высокая ансамблевая культура, бездакорнае пачуццё стылю, каларыстычнае багацце гукавой палітры. Аркестр быў створаны як оперна-сімф. аркестр Усесаюзнага радыё і тэлебачання (арганізатар і першы маст. кіраўнік С.*Самасуд*), з 1981 яго ўзначальваў Г.*Рождественскі*, пад кіраўніцтвам якога калектыў на высокім узроўні выканаў у канцэртах і запісаў на радыё ўсе сімфоніі Брукнера, Дз.Шастаковіча, А.Анегера, Шнітке і інш. Хор (арганізатар і кіраўнік Палянскі) набыў найб. вядомасць пасля ўдзелу ў Міжнар. конкурсе поліфанічных хароў «Гвіда д'Арэца» ў Італіі, дзе стаў лаўрэатам. Яго рэпертуар вялікі і разнастайны, выкананне адметнае высокай вакальна-харавой тэхнікай, прыгожым роўным гучаннем, крышталёвай яснасцю і дакладнасцю інтанавання.

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ АКАДЭМІ́ЧНАЯ ХАРАВА́Я КАПЭ́ЛА РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ імя Р.Р.Шырмы. Створана ў 1940 у Беластоку як Бел. ансамбль песні і танца. Заснавальнік і кіраўнік да 1970 Р.*Шырма*, танц. групай кіраваў І.*Хвораст*. У 1950 ансамбль рэарганізаваны ў Дзярж. хор БССР (з 1944 у Гродне, з 1952 у Мінску), з 1955 Дзярж. хар. капэла БССР, з 1957 акадэмічная, імя Шырмы з 1978. З 1988 у складзе Бел. філармоніі. Маст. кіраўнік і гал. дырыжор Л.*Яфімава* (з 1987). У рэпертуары капэлы апрацоўкі бел. нар. песень, творы бел. кампазітараў, у т.л. М.Аладава, У.Алоўнікава, А.Багатырова, А.Бандарэнкі, Г.Вагнера, Я.Глебава, У.Дарохіна, Э.Казачкова, В.Казлоўскага, І.Кузняцова, М.Куліковіча-Шчаглова, А.Літвіноўскага, І.Лучанка, С.Манюшкі, А.Мдывані, Я.Паплаўскага, Ю.Семянякі, Дз.Смольскага, Л.Шлег і інш., хар. і вак.-сімф. свецкая і царк. музыка рус. і замежных класікаў і сучасных кампазітараў: рэквіемы Дж.Вердзі, В.А.Моцарта, Р.Шумана, Л.Керубіні, А.Брукнера, І.Брамса, Дз.Кабалеўскага, месы І.С.Баха, Брукнера, Моцарта, І.Гайдна, араторыі Дз.Шастаковіча, П.Чайкоўскага, С.Пракоф'ева, хар. канцэрты С.Танеева, П.Часнакова, Дз.Бартнянскага, А.Архангельскага, С.Рахманінава і інш. Капэла выступала з вядомымі сімф. аркестрамі Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Германіі пад кіраўніцтвам Ю.Яфімава, М.Янсанса, Л.Крэмера, Р.Зеехафера, Ч.Грабоўскага, В.Катаева, В.Дуброўскага, П.Д.Панэла, С.Сандэцкіса, Ю.Домаркаса, Ю.Цырука, А.Янчанкі і інш. У розны час капэлай кіравалі У.Раговіч, А.Шунтаў; працавалі спевакі М.Гэадаровіч, Л.Царанкова, М.Шуманскі, В.Юневіч і інш. Калектыў — лаўрэат Міжнар. фестывалю царк. музыкі ў г. Гайнаўка (Польшча, 1993).

Літ.: Смольский Б.С. Государственная академическая хоровая капелла БССР. Мн., 1959; Пуроўскі К. Песні вольных людзей. Мн., 1961.

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ ДУ́МА, 1) прадстаўнічая заканад. ўстанова ў Расіі ў 1906—17. Створана паводле *Маніфеста 17 кастрычніка 1905* ва ўмовах рэвалюцыі 1905—07 пасля таго, як большасць рас. насельніцтва байкатавала выбары ў «*Булыгінскую думу*». Складалася з дэпутатаў, якія выбіраліся шматступеньчата па 4 нераўнапраўных курыях (ад землеўладальнікаў, гар. насельніцтва, сялян і рабочых) на 5 гадоў. Разглядала законапраекты, якія потым абмяркоўваліся ў *Дзяржаўным савеце* і зацвярджаліся царом. 1-я (10.5—21.7.1906, адна сесія; старшыня С.А.Мурамцаў) і 2-я (5.3—15.6.1907, адна сесія; старшыня Ф.А.Галавін). Дз.д. распушчаны царом. Пасля змены выбарчага закона Мікалаем II (чэрв. 1907) у 3-й (14.11.1907—22.6.1912, пяць сесій; старшыня М.А.Хамякоў, з 1910 А.І.Гучкоў, з 1911 М.У.Радзянка) і 4-й (28.11.1912—19.10.1917, пяць сесій; старшыня Радзянка) Дз.д. крыху павялічыўся ўплыў правых манархічных партый (гл. *Чарнасоценцы*). У 1-ю сусв. вайну сесіі думы склікаліся нерэгулярна, узнік «*Прагрэсіўны блок*», а ў ходзе Лют. рэвалюцыі 1917 — Часовы к-т Дз.д., які сфарміраваў Часовы ўрад. Распушчана Часовым урадам 19.10.1917 у сувязі з пач. выбараў ва Устаноўчы сход. Канчаткова скасавана пасля Кастр. рэвалюцыі 1917. У гады дзейнасці думы дэпутаты ад бел. губерняў (сярод іх памешчык Р.А.Скірмунт, гісторык А.П.Сапуноў) у залежнасці ад іх паліт. поглядаў выступалі за культ.-нац. аўтаномію Беларусі (у т.л. ўвядзенне ў школах навучання на бел. мове) або супраць яе і інш. 2) Ніжняя палата Федэральнага сходу (парламента) Рас. Федэрацыі, утвораная паводле канстытуцыі 1993. Яе дэпутаты выбіраюцца на 4 гады (палова па спісах паліт. партый і грамадскіх рухаў, другая палова па аднамандатных акругах паводле мажарытарнай сістэмы), працуюць на прафес. пастаяннай аснове.

Кр.: Калинычев Ф.И. Государственная дума в России: Сб. док. и материалов. М., 1957.

Літ.: Леонтович В.В. История либерализма в России, 1762—1914: Пер. с нем. [2 изд.]. М., 1995. С. 491—542; Запрудник Я. Справа аўтаноміі Беларусі ў першай думе і «Наша ніва» // З гісторыяй на «Вы». Мн., 1994. Вып. 3; Забаўскі М.М. Палітычная барацьба ў Беларусі ў перыяд выбараў у III Дзяржаўную думу // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1987. № 5.

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ МО́ВА, нацыянальная ці афіцыйная мова, статус якой замацаваны ў спецыяльных юрыдычных актах (канстытуцыі, законе аб мовах і інш.). У адпаведнасці з заканадаўствам Дз.м. абслугоўвае ўсе або абсалютную большасць разгалінаванняў афіц. сферы грамадскіх зносін. Сусв. практыка сведчыць, што статус Дз.м. пераважна надаецца *нацыянальнай мове*. *Афіцыйная мова* не абавязкова набывае статус дзяржаўнай, але Дз.м. не можа не прайсці этапу афіц. ўжывання.

У ВКЛ Дз.м. была старабел. мова, што было замацавана ў Статутах ВКЛ 1566 і 1588 і захоўвалася да 1696, калі рашэннем канфедэрацыі саслоўяў Рэчы Паспалітай афіц. мовай была абвешчана польская. У крас. 1918 Рада БНР вярнула бел. мове статус дзяржаўнай.

Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь.

Такім жа статусам, але ўжо разам з літ., польск., рус. і яўр. карысталася бел. мова ў перыяд існавання Бел.-Літ. ССР (люты—жн. 1919). З 1924 у БССР у адпаведнасці з аб'яўленай палітыкай беларусізацыі Дз.м. аб'яўляліся бел., рус., польск. і яўр. мовы. У адпаведнасці з Законам «Аб мовах у Беларускай ССР», прынятым Вярх. Саветам Беларусі 26.1.1990, і *Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь* (27.7.1990) у 1994 дзярж. статус бел. мовы быў замацаваны ў *Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь*. Згодна з унесенымі ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь змяненнямі, паводле вынікаў лістападаўскага (1996) рэферэндуму Дз.м. акрамя беларускай прызнана і *руская мова*. *Л.М.Лыч.*

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ РАЁННАЯ ЭЛЕКТРАСТА́НЦЫЯ (ДРЭС), цеплавая кандэнсацыйная электрастанцыя, якая выпрацоўвае толькі электрычную энергію. Першая ў свеце раённая электрастанцыя на мясц. паліве (торфе) магутнасцю 15 Мвт пабудавана ў 1912—14 пад Масквой па ініцыятыве рус. інжынера Р.Э.Класона. Планам ГОЭЛРО (1920) прадугледжвалася збудаванне некалькіх цеплавых электрастанцый, з іх найб. вядомая Шатурская ДРЭС, у Беларусі — Асінаўская ДРЭС (гл. *Беларуская ДРЭС*). Паступова тэрмін ДРЭС амаль страціў свой першапачатковы сэнс («раённая») і ў сучасным разуменні азначае кандэнсацыйную электрастанцыю даволі вял. магутнасці, якая працуе ў аб'яднанай энергасістэме побач з інш. буйнымі электрастанцыямі. Першай і адной з самых буйных цеплавых электрастанцый блочнага тыпу ў Беларусі з'яўляецца *Бярозаўская ДРЭС* (920 тыс. кВт). У *Беларускай энергетычнай сістэме* працуюць таксама *Лукомская ДРЭС* (найбольшая з такога тыпу электрастанцый; 2400 тыс. кВт), б. Васілевіцкая ДРЭС (гл. *Светлагорская ЦЭЦ*).

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ СЛУ́ЖБА, від працоўнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца грамадзянамі на прафес. аснове ў *дзяржаўным апараце*. У Рэспубліцы Беларусь праходжанне Дз.с. рэгламентуецца Канстытуцыяй, Законам «Аб асновах службы ў дзяржаўным апараце» ад 23.11.1993, інш. нарматыўнымі актамі. Права на Дз.с. маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь незалежна ад сац. і маёмаснага становішча, расавай і нац. прыналежнасці, полу, адносін да рэлігіі, паліт. поглядаў. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства могуць прыцягвацца для работы ў дзярж. апараце як кансультанты ці эксперты. Да дзяржслужачых адносяцца асобы, якія займаюць у прадугледжаным заканадаўствам парадку пасады ў дзярж. апараце, наздзелены адпаведнымі паўнамоцтвамі і атрымліваюць за сваю працу заработную плату. Асн. правы і абавязкі дзярж. служачых, правілы іх паводзін, парадак праходжання і спынення Дз.с. рэгулююцца заканадаўствам. Пры пэўных абставінах дзярж. служачыя маюць права на *адстаўку*. *С.У.Скаруліс.*

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ ТА́ЙНА, звесткі ваен., эканам. і паліт. характару, рознага роду адкрыцці, вынаходствы і інш., якія адносяцца да дзярж. сакрэтаў і ахоўваюцца дзяржавай. Ахова Дз.т. прадугледжвае шэраг прававых, арганізац., інж.-тэхн. і інш. мер па абмежаванні распаўсюджання звестак, аднесеных да дзярж. сакрэтаў. У Рэспубліцы Беларусь паводле Закона «Аб дзяржаўных сакрэтах» ад 29.11.1994 ахове падлягаюць звесткі, распаўсюджанне якіх можа нанесці шкоду нац. бяспецы, абараназдольнасці і жыццёва важным інтарэсам дзяржавы. Пералік гэтых звестак зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь па прадстаўленні Савета Міністраў. Ахову Дз.т. ажыццяўляюць органы заканад., выканаўчай і суд. улады, органы мясц. кіравання і самакіравання, органы дзярж. кантролю і нагляду, юрыд. асобы. Парадак карыстання і распараджэння звесткамі, якія складаюць Дз.т., вызначаецца заканадаўствам. Нагляд за заканадаўствам у дзейнасці па ахове Дз.т. ўскладзены на Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь і падначаленых яму пракуроў. Выдаванне Дз.т. з'яўляецца крымін. злачынствам і цягне за сабой крымін. адказнасць. *С.У.Скаруліс.*

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ ЎЛА́СНАСЦЬ, маёмасць, якая належыць дзяржаве на праве ўласнасці; адна з формаў уласнасці. У Рэспубліцы Беларусь да Дз.у. адносяцца т.зв. рэсп. ўласнасць і ўласнасць адм.-тэр. утварэнняў — камунальная ўласнасць. Выключна Дз.ў. складаюць нетры, воды, лясы. Ва ўласнасці дзяржавы знаходзяцца землі с.-г. прызначэння, маёмасць рэсп. органаў улады і кіравання, культ. і гіст. каштоўнасці, сродкі рэсп. бюджэту, дзярж. банкі, страхавыя, рэзервовыя і інш. фонды; могуць знаходзіцца таксама прадпрыемствы і нар.-гасп. комплексы, навуч. ўстановы, аб'екты сац.-культ. сферы, н.-д. і праектныя ін-ты і арг-цыі, інш. маёмасць, якая забяспечвае суверэнітэт, гасп. самастойнасць рэспублікі, яе эканам. і сац. развіццё. Законам могуць быць вызначаны і інш. аб'екты, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы. Распараджэнне маёмасцю, якая знаходзіцца ва ўласнасці рэспублікі, ажыццяўляе ўрад — СМ Рэспублікі Беларусь.

Ва ўласнасці адм.-тэр. утварэнняў могуць знаходзіцца маёмасць органаў улады і кіравання адм.-тэр. ўтварэння, сродкі мясц. бюджэту, жыл. фонд і жыл.-камунальная гаспадарка мясц. Савета дэпутатаў, а таксама прадпрыемствы сельскай гаспадаркі, гандлю, быт. абслугоўвання, транспарт, прамысл., буд. і інш. прадпрыемствы і комплексы, установы нар. адукацыі, культуры, аховы здароўя і інш. маёмасць, неабходная для эканам. і сац. развіцця адпаведнай тэрыторыі. Распараджэнне і кіраванне дзярж. маёмасцю, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, ажыццяўляюць ад імя насельніцтва адм.-тэр. утварэнняў адпаведныя Саветы дэпутатаў ва ўстаноўленым законам парадку.

Адносіны Дз.у. ў Рэспубліцы Беларусь рэгулююцца Канстытуцыяй і Законам «Аб уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь» ад 11.12.1990, інш. прававымі актамі. *Г.А.Маслыка.*

ДЗЯРЖА́ЎНАЯ ШКО́ЛА, ю р ы д ы ч н а я ш к о л а, адзін з гал. кірункаў у рас. гістарыяграфіі ў сярэдзіне 19 — пач. 20 ст. Пачала складвацца ў 1840-я г. Асн. ідэі распрацаваны К.Дз.*Кавелiным*, С.М.*Салаўёвым*, Б.М.*Чычэрыным*, развіты В.І.*Сергеевічам*, П.М.*Мілюковым*, А.С.*Лапа-Данілеўскім*, М.М.*Багаслоўскім*, А.А.*Кізеветэрам*, С.Ф.*Платонавым*, М.А.*Дзяканавым* і інш., а таксама ў ранніх працах Ю.У.*Гацье*, С.У.Бахрушына, Б.Дз.*Грэкава*. Прадстаўнікі школы лічылі дзяржаву і яе дзейнасць асн. рухаючай сілай гіст. працэсу (адсюль назва), аддавалі значную ўвагу гісторыі рас. права, асабліва прыгоннага (адсюль другая назва), процiпастаўлялі гісторыю Расіі гісторыі краін Зах. Еўропы.

Літ.: Шапиро А.Л. Русская историография с древнейших времен до 1917 г. [2 изд.]. М., 1993. С. 419—433, 564—602.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АБВІНАВА́ЎЦА, службовая асоба, якая падтрымлівае перад судом абвінавачанне па крымінальнай справе. У Рэспубліцы Беларусь, некаторых інш. краінах функцыі Дз.а. выконвае *пракурор*. Удзел Дз.а. ў суд. разборы спраў — адна з формаў *пракурорскага нагляду* за выкананнем законнасці. Парадак удзелу Дз.а. ў суд. разборы рэгламентуецца працэсуальным заканадаўствам.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АКАДЭМІ́ЧНЫ ВЯЛІ́КІ СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР ІМЯ П.І.ЧАЙКО́ЎСКАГА Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі. Створаны ў 1930 у Маскве як Сімф. аркестр Усесаюзнага радыё, з 1937 вялікі, з 1964 Усесаюзнага радыё і тэлебачання, з 1974 Вял. акадэмічны сімф. аркестр Усесаюзнага тэлебачання і радыё, з 1994 аркестр Рас. дзярж. тэлерадыёкампаніі «Астанкіна», з 1996 сучасная назва. Аркестрам кіравалі А.*Арлоў* (з 1930), М.*Галаванаў* (з 1937), А.*Гаўк* (з 1953), Г.*Раждественскі* (з 1961). З 1974 гал. дырыжор і маст. кіраўнік У.*Федасееў*. У розны час з аркестрам працавалі дырыжоры В.*Сук*, Л.*Штэйнберг*, С.*Самасуд*, Я.*Мравінскі*, А.*Мелік-Пашаеў*, Н.*Рахлін*, К.*Іваноў*, Э.Клайбер, О.Фрыд, Ф.Штыдры, Г.Себасцьян, Л.Стакоўскі, Ф.Канвічны, Дж.Джарджэску, В.Ферэра, А.Клюітэнс і інш. У ансамблі з аркестрам выступалі выдатныя айч. і замежныя інструменталісты і спевакі. У рэпертуары аркестра буйныя сімф. і вак.-сімф. творы кампазітараў-класікаў, сучасных зарубежных і айч. аўтараў. Калектыў — першы выканаўца многіх твораў П.Чайкоўскага, С.Пракоф'ева, Р.Гліэра, М.Мяскоўскага, Ю.Шапорына, Дз.Шастаковіча, А.Хачатурана, Дз.Кабалеўскага, Ц.Хрэннікава, К.Караева, В.Мурадэлі, А.Баланчывадзе, А.Тактакішвілі, Р.Шчадрына, Б.Чайкоўскага, М.Вайнберга, Г.Свірыдава і інш., удзельнічаў у пастаноўцы многіх опер класічнага і сучаснага рэпертуару.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АКАДЭМІ́ЧНЫ НАРО́ДНЫ АРКЕ́СТР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ імя І.І.Жыновіча. Пачаў дзейнасць у Мінску ў 1930 як Бел. дзярж. ансамбль нар. інструментаў (створаны на аснове ансамбля нар. інструментаў Бел. муз. тэхнікума, 1928). Першы маст. кіраўнік Дз.*Захар* (1930—35), з 1946 маст. кіраўнік і гал. дырыжор І.*Жыновіч*, з 1975 — М.*Казінец*. У 1937 ператвораны ў Аркестр бел. нар. інструментаў у складзе Бел. філармоніі, з 1948 наз. Дзярж. нар. аркестр БССР, імя І.Жыновіча з 1974, акадэмічны з 1987. Аркестр унікальны па складзе інструментаў і па гучанні. Асн. месца належыць бел. цымбалам, уключае таксама дудкі і ліры, баяны, флейты, габоі, кларнеты, групу ўдарных. У рэпертуары больш за 1000 арыгінальных твораў і перапрацэнняў бел. кампазітараў, у т.л. У.Алоўнікава, А.Багатырова, Я.Глебава, Я.Дзягцярыка, Жыновіча, Э.Зарыцкага, В.Іванова, С.Картэса, У.Кур'яна, А.Мдывані, В.Помазава, Ю.Семянякі, Дз.Смольскага, Р.Суруса, К.Цесакова, Я.Цікоцкага, М.Чуркіна і інш., кампазітараў-класікаў, сучасных замежных аўтараў. З аркестрам выступалі майстры бел. сцэны Л.Александроўская, Л.Аляксеева, З.Бабій, І.Балоцін, М.Ворвулеў, С.Данілюк, М.Дзянісаў, С.Друкер, В.Малькова, Р.Млодак, Т.Ніжнікава, І.Пятроў, І.Сарокін, Н.Ткачэнка, а таксама спевакі Расіі, Украіны, Зах. Еўропы і інш. Калектыў гастраліруе за мяжой, удзельнік шматлікіх фестываляў і конкурсаў. У розны час у аркестры працавалі цымбалісты А.*Астрамецкі*, В.*Бурковіч*, С.*Навіцкі*, Х.Шмелькін, М.*Шмелькін* і інш.; працуюць (1997) салісты А.*Курмакін*, С.*Лясун*, А.*Рудкоўскі*.

Літ.: Жинович И.И. Государственный белорусский народный оркестр. Мн., 1958; Ракова Е.Я. Государственный народный оркестр БССР имени И.И.Жиновича. Мн., 1978.

А.Я.Ракава.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АКАДЭМІ́ЧНЫ НАРО́ДНЫ ХОР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ імя Г.І.Цітовіча. Створаны ў 1952 пераважна з удзельнікаў хору в. Вял. Падлессе Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. і фалькл. гурткоў. Арганізатар і маст. кіраўнік у 1952—74 Г.*Цітовіч*, з 1975 маст. кіраўнік і гал. дырыжор М.*Дрынеўскі*. У 1959—64 Бел. дзярж. ансамбль песні і танца, з 1965 Дзярж. нар. хор БССР, з 1983 акадэмічны, з 1988 імя Цітовіча, з 1992 сучасная назва. Уключае хар., танц. і аркестравую групы, якія выступаюць у сумесных канцэртных праграмах і самастойна. Хор складаецца з 5 вак. груп — 4 асноўных і групы падгалоскаў. У складзе жаночай групы ў розны час працавалі актэт (існаваў да 1959), квартэт «*Купалінка*», трыо «Рабіначка». У рэпертуары апрацоўкі бел. нар. песень, бел. нар. танцы і найгрышы, песні інш. народаў, апрацоўкі і арыгінальныя творы бел. кампазітараў, у т. л. У.Алоўнікава, У.Будніка, Дрынеўскага, Л.Захлеўнага, У.Карызны, І.Кузняцова, В.Кузняцова, І.Лучанка, Э.Наско, С.Палонскага, Ю.Семянякі, М.Сіраты і інш., творы духоўнай хар. музыкі класікаў і сучасных бел. кампазітараў. Творчая дзейнасць калектыву мае 3 асн. кірункі: этнагр. (песня, крыху адрэдагаваная для сцэны, раскрываецца ў сваім першародным гучанні); тэатралізавана-сінт. (у выглядзе разгорнутай вак.-інстр.-харэаграфічнай кампазіцыі); уласна хар. майстэрства спеваў а капэла. У калектыве працуюць (1997): гал. хормайстар І.Абразевіч, гал. балетмайстар В.*Варановіч*, кіраўнік аркестравай групы М.*Сірата*; сярод салістаў В.*Крыловіч*, Н.*Раманская*, А.*Рамашкевіч*, Н.*Чарадніченка*, Ю.*Паўлішын*. У розны час у ім працавалі: хормайстры К.*Паплаўскі*, А.*Бальцэвіч*, балетмайстры П.*Акулёнак*, І.*Цюрын*, салісты хору М.*Адамейка*, В.Антонава, Г.*Аўдзеенка*, У.*Кавальчук*, В.*Марозава*, П.*Навасад*, танцоўшчык Ю.*Сляпнёў*, баяністы М.*Ліпчык*, С.*Суседчык*. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1968 (жаночая група і Цітовіч).

Літ.: Мухаринская Л.С. Белорусский государственный народный ансамбль песни и танца. Мн., 1959; Можейко З., Хвисюк Н. Песня давняя — песня новая // Неман. 1982. № 3; Дзяржаўнаму акадэмічнаму народнаму хору БССР — 30 гадоў // Мастацтва Беларусі. 1983. № 4.

З.Я.Мажэйка.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АКАДЭМІ́ЧНЫ РУ́СКІ ДРАМАТЫ́ЧНЫ ТЭА́ТР БЕЛАРУ́СІ. Створаны ў 1932 у Бабруйску на базе вандроўнай рус. трупы як Дзярж. рус. драм. т-р БССР, у 1955—92 імя М.Горкага, з 1994 акадэмічны. У 1935—41 і 1944 працаваў у Магілёве, з крас. 1945 у Гродне, з ліп. 1947 у Мінску. Заснавальнік і маст. кіраўнік (1932—36) У.*Кумельскі*. Праграму і творчае аблічча т-ра 1-й пал. 1930-х г. вызначалі яго сцэн. індывідуальнасць, ідэйна-маст. і эстэт. погляды, якія склаліся пад уплывам абвешчанага закліку да дзеячаў мастацтва краіны падначаліць т-р інтарэсам рэвалюцыі. Гэта абумовіла яго рэпертуар і прынцыпы сцэн. ўвасаблення, класава-сац. падыход да інтэрпрэтацыі тагачаснай драматургіі, класічнай рус. і сусв. спадчыны. Кумельскі імкнуўся спалучаць акрэсленую грамадзянскую пазіцыю т-ра з маляўнічай формай спектакляў, дасягаць глыбокага

Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь.

пранікнення ў характары персанажаў. У рэпертуары пераважала сав. драматургія: «Чапаеў» паводле Дз.Фурманава, «Гібель эскадры» А.Карнейчука, «Мой сябра» М.Пагодзіна, «Узнятая цаліна» паводле М.Шолахава, «Любоў Яравая» К.Транёва, «Браняпоезд 14-69» У.Іванава, «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага. Асаблівай увагай карысталася драматургія М.Горкага. Праграмным і этапным спектаклем т-ра стаў «Ягор Булычоў і іншыя». Поспех пастановак гэтага перыяду шмат у чым вызначаўся ўдзелам у іх Кумельскага — акцёра яркай індывідуальнасці. Трупа фактычна кожны сезон фарміравалася нанава, пастаянна мяняліся маст. кіраўнікі. Найб. плённы перыяд звязаны з дзейнасцю рэжысёра А.Данаці (1936—38). У 1939 калектыў узначаліў Дз.*Арлоў*, была праведзена рэарганізацыя т-ра, ён папоўніўся выпускнікамі Ленінградскага і Маскоўскага тэатр. вучылішчаў. Сярод спектакляў «Таленты і паклоннікі» А.Астроўскага, «Каварства і каханне» Ф.Шылера. З пач. Вял. Айч. вайны т-р спыніў дзейнасць. Адноўлены летам 1943 у Маскве як франтавы. Сярод пастановак першых пасляваен. гадоў: «Сустрэча ў цемры» Ф.Кнорэ, «Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра, «Тры сястры» А.Чэхава, «Цар Фёдар Іаанавіч» А.К.Талстога. Вызначальнымі ў рэпертуары канца 1940-х г. былі пастаноўкі класічных твораў: п'ес Астроўскага «Жаніцьба Бялугіна» (нап. з М.Салаўёвым), «Апошняя ахвяра» і «На бойкім месцы», Чэхава «Дзядзька Ваня», М.Горкага «Дзеці сонца», Шэкспіра «Атэла». З пастановак тагачасных п'ес найб. поспехам карысталася «Старыя сябры» Л.Малюгіна. У 1950 т-р у другі раз пасля інсцэнізацыі «Сымона Карыз-ны» М.Зарэцкага ў 1935 звярнуўся да бел. драматургіі: пастаўлена п'еса В.Палескага «Песня нашых сэрцаў», у 1953 адноўлена пад назвай «Што пасееш, тое і пажнеш». 1950-я г. ў творчасці т-ра адметныя дзейнасцю рэжысёра высокай тэатр. культуры В.*Фёдарава*. Сярод лепшых пастановак гэтага перыяду: «Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча, «Порт-Артур» паводле А.Сцяпанава, «Каменнае гняздо» Х.Вуаліёкі. Асаблівае месца сярод іх займалі «Варвары» М.Горкага (пасля паказу гэтага спектакля на Дэкадзе бел. мастацтва ў Маскве т-ру было прысвоена імя М.Горкага) і «Кароль Лір» Шэкспіра, прызнаныя дасягненнем тэатр. мастацтва краіны 1950-х г. Спектакль «Кароль Лір» і найперш выкананне А.Кіставым гал. ролі былі высока ацэнены дзеячамі тэатр. мастацтва Англіі.

У канцы 1950 — пач. 1960-х г. плённым было супрацоўніцтва т-ра з рэжысёрамі М.*Сіваком* («Галоўная стаўка» Губарэвіча, «Аптымістычная трагедыя» Вішнеўскага, «Барабаншчыца» А.Салынскага, «Улада цемры» Л.Талстога) і В.*Рэдліх* («Беспасажніца» Астроўскага, «Дзеці сонца» М.Горкага, «Дванаццатая гадзіна» А.Арбузава, «Антоній і Клеапатра» Шэкспіра). Рэпертуар папоўніўся п'есамі бел., сав. і тагачасных замежных драматургаў. У 2-й пал. 1960-х — 1-й пал. 1970-х г. назіралася стракатасць рэпертуару, з'яўляліся спектаклі сярэдняга ўзроўню. Поспехі калектыву ў гэты перыяд звязаны з асобнымі пастаноўкамі класічных твораў: «Маскарад» М.Лермантава, «Звычайная гісторыя» паводле І.Ганчарова, «Марыя Сцюарт» Шылера. Вылучаліся таксама спектаклі: «А досвіткі тут ціхія» паводле Б.Васільева, «Узыходжанне на Фудзіяму» Ч.Айтматава і К.Мухамеджанава, «Варшаўская мелодыя» Л.Зорына, «Мілы лгун» Дж.Кілці, «Двое на арэлях» У.Гібсана. Творчы ўздым т-ра 1970-х г. звязаны з дзейнасцю рэжысёра Б.*Луцэнкі*, праграмнымі спектаклямі якога сталі «Макбет» Шэкспіра (паказаны на міжнар. шэкспіраўскім фестывалі ў ФРГ, 1981), «Трохграшовая опера» Б.Брэхта, «Трагедыя чалавека» І.Мадача, «Лазня» У.Маякоўскага. Т-р набывае сваё адметнае аблічча. Павышаная цікавасць да маральна-этычных аспектаў, асэнсаванне сутнасці чалавечага быцця, барацьба дабра і зла па-мастацку даследуюцца ў спектаклях «Пайсці і не вярнуцца» паводле В.Быкава, «Вяртанне ў Хатынь» паводле А.Адамовіча, «Апошняя інстанцыя» М.Матукоўскага, «Апошнія» М.Горкага, «Салодкагалосая птушка юнацтва» Т.Уільямса і інш. Творчы дыяпазон т-ра пашырылі спектаклі рэжысёраў У.*Маланкіна*, М.Сулі-

Да арт. **Дзяржаўны акадэмічны рускі драматычны тэатр Беларусі**. Сцэна са спектакля «Макбет» У.Шэкспіра.

Да арт. **Дзяржаўны акадэмічны рускі драматычны тэатр Беларусі**. Сцэна са спектакля «Варвары» М.Горкага.

Да арт. **Дзяржаўны акадэмічны рускі драматычны тэатр Беларусі**. Сцэна са спектакля «На Залатым возеры» Э.Томпсана.

Да арт. **Дзяржаўны акадэмічны рускі драматычны тэатр Беларусі**. Сцэна са спектакля «Начныя карлікі і Антыгона» Л.Разумоўскай.

мава, А.Даброціна, А.Каца, М.*Кавальчыка*, А.Кузняцова, Б.Глаголіна, А.Карпава. 1980-я г. ў дзейнасці т-ра найперш звязаны з пастаноўкамі рэж. В.*Маслюка* («Знак бяды» паводле аповесці В.Быкава, Дзярж. прэмія Беларусі 1986, «Гамлет» Шэкспіра). Сярод інш. спектакляў гэтага перыяду: «Начныя карлікі і Антыгона» («Дарагая Алена Сяргееўна») Л.Разумоўскай, «Зоркі на ранішнім небе» А.Галіна, «І быў дзень» («Звалка») А.Дударава, «Незвычайныя прыгоды салдата Івана Чонкіна» паводле У.Вайновіча. Ставяцца п'есы такіх буйных сучасных драматургаў, як Э.Олбі, Ф.Дзюрэнмат, Т.Уільямс, Ю.О'Ніл, К.Чапек. У пач. 1990-х г. т-р зноў узначаліў Луцэнка. Сярод спектакляў: «Блаславі нас, госпадзі...» С.Бельцюкова і А.Залётнава, «Драўляны рыцар» С.Кавалёва, «Перпетум мобіле, ці Вечар яўрэйскіх анекдотаў» Луцэнкі, «Хрыстос і Антыхрыст» паводле Дз.Мераж-

Да арт. **Дзяржаўны акадэмічны рускі драматычны тэатр Беларусі**. Сцэна са спектакля «Майстры» паводле М.Булгакава.

коўскага, «Букееў і кампанія» М.Горкага, «Прасцячкі нечаканых астравоў» Б.Шоу, «Амфітрыён» паводле Плаўта. У 1981 у т-ры адкрыта Малая сцэна (спектаклі «Вячэра» Ж.К.Брысвіля, «На Залатым возеры» Э.Томпсана).

Важкі ўклад у развіццё т-ра зрабілі нар. арт. СССР Я.Палосін, нар. артысты Беларусі Г.Абуховіч, Арлоў, А.Кістаў. У розныя гады ў т-ры працавалі: Ф.Шмакаў, нар. артысты Беларусі Я.Карнавухаў, Р.Качаткоў, Ю.Ступакоў, В.Філатаў, І.Шаціла, нар. арт. Расіі К.Шышкін, засл. артысты Беларусі М.Аблаў, А.Бялоў, К.Верамейчык, Л.Весніна, В.Воінкаў, В.Захарава, А.Кашкер, В.Краўчанка, М.Кузьменка, І.Лакштанава, І.Лакштанаў, Г.Някрасаў, І.Ражба, М.Сокал, Т.Трушына, В.Чэмберг, А.Шапс, А.Шкапскі, засл. работнік культуры Беларусі Б.Вішкароў, засл. дзеячы маст. Беларусі акцёры і рэжысёры Ю.Арынянскі і Кумельскі, сцэнографы В.Галубовіч, А.Грыгар'янц, Ю.Тур.

У складзе трупы (1997): нар. артысты СССР А.Клімава, Р.Янкоўскі, нар. артысты Беларусі В.Клебановіч, Б.Масумян, Ю.Сідараў, засл. артысты Беларусі З.Асмалоўская, В.Бандарэнка, Л.Былінская, Э.Гарачы, А.Ткачонак, А.Шах-Парон, У.Шэлестаў, засл. арт. Расіі А.Брухацкі, акцёры У.Курган, Я.Лявонцьеў, Г.Маланкіна, А.Пастрэвіч, Н.Чамадурава і інш. Гал. рэжысёр (з 1991) нар. арт. Беларусі Луцэнка, гал. мастак У.Чарнышоў. *Б.І.Бур'ян.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АКАДЭМІ́ЧНЫ РУ́СКІ ХОР. Створаны ў Маскве ў 1936 на базе вак. ансамбля Усесаюзнага радыё як Дзярж. хор СССР. У 1942 рэарганізаваны ў Дзярж. хор рус. нар. песні, з 1955 акадэмічны, сучасная назва. Арганізатар, першы маст. кіраўнік і гал. дырыжор А.*Свешнікаў* (да 1980). З 1987 гал. дырыжор і маст. кіраўнік У.*Мінін*. Першапачатковай задачай калектыву было адраджэнне старадаўніх рус. нар. песень (сялянскіх, гар., фабрычных, студэнцкіх, салдацкіх), развіццё нац. вак.-харавых традыцый. Сярод найб. вядомых песень «Вячэрні звон», «Гібель «Варага», «Ах ты, стэп шырокі», песні гадоў Вял. Айч. вайны. З 1950-х г. у рэпертуары хар. музыка ўсіх часоў і народаў (каля 1000 твораў), у т.л. хары а капэла, буйнейшыя творы кантатна-аратарыяльнага і вак.-сімф. жанраў, з 2-й пал. 1980-х г. — шматлікія творы царк. музыкі. Гал. ўвага аддаецца развіццю традыцый рус. вак. мастацтва. Хору ўласцівыя дасканалае валоданне стылем а капэла, маналітнасць і стройнасць гучання, багацце каларыстычных адценняў, высокая хар. культура.

Літ.: Л о к ш и н Д. Государственный хор русской песни. М., 1955; Хоровое искусство: [Сб. ст.]. Вып. 2. Л., 1971.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АКАДЭМІ́ЧНЫ СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Створаны ў 1928 у Мінску пры Бел. радыёцэнтры на аснове аркестраў Бел. муз. тэхнікума і БДТ-1. З 1930 у штаце радыёцэнтра, з 1937 у складзе Бел. філармоніі. З 1961 Дзярж. сімф. аркестр БССР, з 1980 акадэмічны. Гал. дырыжор М.Кац (з 1997). У рэпертуары творы рус. і зарубежных кампазітараў-класікаў, сучасных кампазітараў, сімф. і вак.-сімф. творы бел. аўтараў, у т.л. Л.Абеліёвіча, М.Аладава, У.Алоўнікава, А.Багатырова, С.Бельцюкова, У.Будніка, Г.Вагнера, В.Войціка, Я.Глебава, У.Дарохіна, В.Капыцько, С.Картэса, В.Кузняцова, А.Мдывані, П.Падкавырава, Я.Паплаўскага, Р.Пукста, Дз.Смольскага, А.Хадоскі, К.Цесакова, Я.Цікоцкага, М.Чуркіна і інш. Сярод аркестрантаў (1997): Р.Ігнацьеў (кларнет), В.Ціхевіч (флейта).



Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь.

У розны час у аркестры працавалі дырыжоры А.Бяссмертны, І.*Гітгарц*, М.Міхайлаў, І.*Мусін*, Т.*Каламійцава*, М.*Шнейдэрман*, Б.*Афанасьеў*, В.*Дуброўскі*, В.*Катаеў*, Ю.*Яфімаў*, П.Д.Панэл; канцэртмайстар Ю.*Гершовіч*, салісты-інструменталісты С.*Асновіч* і Г.*Клачко* (скрыпка), В.*Волкаў* (труба), Г.*Забара* (кларнет), П.*Кірыльчанка* (альт), Б.*Скабло* (віяланчэль), С.*Сяргеенка* (флейта), В.*Фралоў* (габой), Ч.*Юшкевіч* (валторна). З аркестрам выступалі вядомыя рас. і зах.-еўрап. дырыжоры А.*Гаўк*, Дз.*Кітаенка*, Я.*Мравінскі*, Н.*Рахлін*, Ю.*Сімонаў*, У.*Федасееў*, Ю.*Цемірканаў*, К.Зандэрлінг, К.Мазур, К.Эстэррайхер, піяністы Л.*Аборын*, Э.*Гілельс*, К.*Ігумнаў*, Г. і С.Нейгаўзы, С.*Рыхтэр*, П.*Серабракоў*, Я.Фліер, Б.Джайніс, Х.Л.*Клайберн*, Дж.Огдан, Д.Полак, Г.*Чэрны-Стэфаньская*; скрыпачы І.*Бязродны*, Л.*Коган*, Д.*Ойстрах*, М.Палякін, М.*Эрдэнка*, І.*Менухін*, І.Стэрн і інш.

Літ.: Журавлев Д.Н. Государственный симфонический оркестр Белорусской ССР. Мн., 1961; Загородний Г.Н. Белорусская государственная филармония. Мн., 1981; Капилов А.Л. Государственный симфонический // Неман. 1981. № 5.

А.Л.Капілаў.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АНСА́МБЛЬ ТА́НЦА РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Створаны ў 1959 у Мінску. Уключае балетную трупу і аркестр. Першыя маст. кіраўнікі А.*Апанасенка* (1959—71) і С.*Дрэчын* (1971—73), з 1986 В.*Дудкевіч*; кіраўнік аркестра С.*Хвашчынскі* (з 1991). У рэпертуары больш за 100 пастановак: танцы і харэаграфічныя кампазіцыі, створаныя на аснове бел. танц. фальклору («Лявоніха», «Лянок», «Весялуха», «Мяцеліца», «Перапёлачка», «Каханачка», «Маталіха», «Полька-Янка», «Крыжачок», «На Купалле», «Беларуская рапсодыя», «Неглюбскія вячоркі», «Спеў дубраў», «Арэлі», «Церніца»), фальклору інш. народаў, сюжэтныя пастаноўкі («Беларуская партызанская», «Сінявокая і неўміручая», «Полечка-поле», «Хатынь», «Вечарына»), праграма «Карагод сяброў», гумарыстычныя сцэнкі («Крутуха», «Дырыжор аркестра» і інш.). У сваіх інтэрпрэтацыях бел. нар. танцаў ансамбль імкнецца захаваць іх характэрнасць, лёгкасць, зграбнасць рухаў, вынаходлівасць харэаграфічнага малюнка. Сярод артыстаў (1997) М.*Ліпчык* (баян). У розны час у ансамблі працавалі маст. кіраўнікі Г.*Маёраў*, В.Бутрымовіч, балетмайстры Г.*Мартынаў*, Я.*Штоп*, артысты балета М.*Апанасенка*, Г.*Белавусава*, С.*Вуячыч*, А.*Гарэлік*, І.*Цюрын*, кіраўнік аркестра У.Багадайка.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АПАРА́Т, сістэма органаў дзяржавы, праз якія забяспечваецца выкананне яе ўладных паўнамоцтваў. У Дз.а. Рэспублікі Беларусь уваходзяць пастаянныя штаты Нац. сходу, адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў, мін-ваў, дзярж. к-таў, ведамстваў, мясц. органаў дзярж. улады і кіравання, судоў, пракуратуры, дзярж. кантролю, Нац. банка, дыпламат. прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў, мытных органаў. Паводле бел. заканадаўства дзейнасць Дз.а. грунтуецца на прынцыпах законнасці, прыярытэту правоў і законных інтарэсаў грамадзян перад інтарэсамі дзяржавы; абавязковасці выканання рашэнняў, прынятых вышэйшымі дзярж. органамі і службовымі асобамі ў межах паўнамоцтваў, для ніжэйстаячых дзярж. органаў; галоснасці ў рабоце рэгулярнымі паведамленнямі адпаведнага дзярж. органа ў сродках масавай інфармацыі і інш. Гл. таксама *Дзяржаўная служба*.

Г.А.Маслыка.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРКЕ́СТР СІМФАНІ́ЧНАЙ І ЭСТРА́ДНАЙ МУ́ЗЫКІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Створаны ў 1987. Маст. кіраўнік і гал. дырыжор М.*Фінберг*. У складзе аркестра «Бігбэнд» (кіраўнік Фінберг), камерны аркестр (кіраўнік В.*Сарока*), ансамбль салістаў (кіраўнік Б.*Нічкоў*), ансамбль І.Сацэвіча. Аранжыроўшчыкі аркестра А.*Шпянёў*, У.Ткачэнка; сярод артыстаў В.*Шчарыца* (труба), вакалісты М.*Скорыкаў*, Я.Навуменка. У рэпертуары эстр. песні, творы сімф., джазавай і эстр. музыкі сучасных, у т.л. бел., кампазітараў: У.Алоўнікава, А.Багатырова, У.Будніка, Г.Вагнера, Я.Глебава, Г.Гарэлавай, А.Елісеенкава, Э.Зарыцкага, Л.Захлеўнага, В.Іванова, У.Кур'яна, І.Лучанка, І.Паліводы, У.Прохарава, В.Раінчыка, Ю.Семянякі, Дз.Смольскага, Р.Суруса, Шпянёва, Г.Гараняна, А.Мажукова, А.Пахмутавай, А.Пятрова, Ю.Саульскага, Г.Свірыдава, М.Фрадкіна, Дз.Шастаковіча, Р.Шчадрына і інш. На базе аркестра праведзены фестывалі польскай песні (1988—1991), «*Славянскі кірмаш*» (1992—97) у Віцебску, бел. песні і паэзіі ў г. Маладзечна (1993—96), джазавай музыкі ў Мінску (1994—97), «Музы Нясвіжа» (1996, 1997), 3 фестывалі «Ступень да Парнаса» (Масква), аўтарскія вечары песні на словы паэтаў Я.Купалы, М.Багдановіча, А.Куляшова, Р.Барадуліна, Г.Бураўкіна, Л.Дранько-Майсюка, У.Карызны, У.Някляева і інш.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў БРЭ́СЦКАЙ ВО́БЛАСЦІ. Засн. ў 1940 у Брэсце. Зберагае дакументы па гісторыі вобласці з 1919. На 1.1.1997 у архіве 2957 фондаў, 1 011 177 спраў. Буйнейшы комплекс дакументаў — фонды польскіх устаноў,

Танец «Бульба» ў выкананні Дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь.

арг-цый і прадпрыемстваў, партый і грамадска-паліт. аб'яднанняў, культ.-асв. згуртаванняў, рэліг. устаноў на тэр. Палескага ваяв. і Баранавіцкага пав. Навагрудскага ваяв. ў 1919—39. Захоўвае матэрыялы аб палітыцы ўрада бурж. Польшчы ў Зах. Беларусі, пра сац.-эканам. становішча, пра дзейнасць БСРГ, ТБШ, КПЗБ і інш. арг-цый, дакументы ням. акупац. устаноў і арг-цый Брэсцкай, Пінскай і часткова Баранавіцкай акруг за 1941—44. Зберагае дакументы абласных, раённых, гар. і сельскіх устаноў і арг-цый Брэсцкай і б. Баранавіцкай і Пінскай абл. за 1939—41 і з 1944. Гэта матэрыялы пра мерапрыемствы сав. улады пасля далучэння Зах. Беларусі да БССР, пра пасляваен. сац.-эканам. і культ. развіццё вобласці: дакументы органаў дзярж. улады і кіравання, органаў і арг-цый КПБ, фонды прамысл. прадпрыемстваў, арг-цый сельскай гаспадаркі, культуры, адукацыі, аховы здароўя. Дакументы на польск., бел., рус. і ням. мовах.

Аддзелы: камплектавання, ведамасных архіваў і справаводства; забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў; дзярж. ўліку і інфарм.-пошукавых сістэм; выкарыстання дакументаў. *Г.В.Церабунь.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў ВІ́ЦЕБСКАЙ ВО́БЛАСЦІ. З 1862 у Віцебску існаваў *Віцебскі цэнтральны архіў старажытных актаў*, з 1903 — губ. архіў. У 1919 заснавана губ. архівасховішча Віцебскага губ. архіўнага ўпраўлення, з 1924 Віцебскі акр. аддзел Цэнтр. архіва БССР, з 1927 Віцебскі гіст. архіў, з 1930 Віцебскае аддзяленне Цэнтр. архіўнага ўпраўлення БССР (у 1933—36 Паўн.-Бел., з 1938 Віцебскі абл. архіў). На 1.1.1997 у архіве 6219 фондаў, 1 033 696 спраў з 1917. Зберагае дакументы губ., пав., валасных, акруговых, раённых, гар. і сельскіх устаноў, арг-цый, прадпрыемстваў, якія дзейнічалі на тэр. Віцебскай вобл., асабістыя фонды. Сярод іх матэрыялы пра гісторыка і краязнаўца А.П.Сапунова, пра Віцебскую нар. мастацкую школу і мастакоў М.Шагала, К.Малевіча, Ю.Пэна, В.Ермалаеву, нар. кансерваторыю і дырыжора М.А.Малько, кампазітара М.В.Анцава, якія працавалі ў ёй, і інш.; успаміны Р.Я.Арансона «Карнілаўскія дні ў Віцебску», дакументы па гісторыі нэпа і калектывізацыі, перыяду Вял. Айч. вайны і інш. Дакументы на бел., рус., ням. і яўр. мовах.

Аддзелы: камплектавання, ведамасных архіваў і справаводства; забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў; інфарм.-пошукавых сістэм; выкарыстання дакументаў; гасп.-раліковы. *А.Р.Трусава.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў ГО́МЕЛЬСКАЙ ВО́БЛАСЦІ. Засн. ў Гомелі ў 1923 як губ. архівасховішча, з 1927 Гомельскі акр. дзярж. архіў, з 1930 Гомельскае аддзяленне Цэнтр. архіўнага ўпраўлення БССР, з 1933 Паўд.-Бел. аддзяленне Цэнтр. архіўнага ўпраўлення БССР, з 1936 Гомельскае аддзяленне Цэнтр. дзярж. архіваў БССР, з 1938 Гомельскі абл. архіў, з 1941 Дзярж. архіў Гомельскай вобл. На 1.1.1997 у архіве 2766 фондаў, 450 тыс. спраў з 1917. Зберагае дакументы губ., пав., валасных, акруговых, абл., гар., раённых і сельскіх арг-цый, устаноў і прадпрыемстваў, якія дзейнічалі і дзейнічаюць на тэр. вобласці. Сярод іх фонды органаў улады і кіравання, устаноў фінансавання, планавання і кантролю, аховы здароўя, культуры і інш., матэрыялы пра эканам. стан вобласці, развіццё сельскай гаспадаркі, адм.-тэр. падзел. Дакументы на бел., рус., польск. і яўр. мовах.

Аддзелы: камплектавання, ведамасных архіваў і справаводства; уліку і забеспячэння захаванасці дакументаў; інфарм.-пошукавых сістэм і аўтаматызаваных архіўных тэхналогій; інфармацыі, публікацыі і навук. выкарыстання дакументаў. *А.Дз.Карасёў.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў ГРО́ДЗЕНСКАЙ ВО́БЛАСЦІ. Засн. ў Гродне ў 1944. На 1.1.1997 у архіве 2135 фондаў, 347 745 спраў з 1919. Зберагае матэрыялы ўстаноў Польшчы з тэр. Навагрудскага ваяв. (акрамя Баранавіцкага і Валожынскага пав.), Ваўкавыскага, Гродзенскага, Аўгустоўскага (часткова) пав. Беластоцкага ваяв. за 1919—39 пра сац. становішча рабочых, сялян, правядзенне агр. рэформаў у Зах. Беларусі, стан асветы, нац. рух, дзейнасць БСРГ, ТБШ, КПЗБ, інш. грамадскіх, паліт. і рэліг. арг-цый. У дакументах ням.-фаш. акупац. устаноў перыяду Вял. Айч. вайны ёсць звесткі пра палітыку каланізацыі, масавыя расправы з мясц. насельніцтвам, барацьбу з партыз. і антыфаш. рухам, правядзенне гасп. мерапрыемстваў. Зберагае дакументы сав. устаноў, арг-цый і прадпрыемстваў за 1939—41 і з 1944; прыватныя калекцыі і архівы. Яны адлюстроўваюць працэс уз'яднання Зах. Беларусі з БССР, пасляваен. сац.-эканам. і культ. развіццё Гродзенскай вобл. Дакументы на бел., рус., польск., ням. і яўр. мовах.

Аддзелы: забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў; інфарм.-пошукавых сістэм; камплектавання, ведамасных архіваў, справаводства і навук.-тэхнічнай апрацоўкі дакументаў; інфармацыі, публікацыі і навук. выкарыстання дакументаў; матэрыяльна-тэхн. забеспячэння, эксплуатацыі і абслугоўвання будынка. *С.А.Кандрашова.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў МАГІЛЁЎСКАЙ ВО́БЛАСЦІ. Засн. ў Магілёве ў 1919 як Магілёўскае губ. архіўнае ўпраўленне, пазней бюро, з 1924 Магілёўскі акр. архіў (аддзел) Цэнтр. архіва БССР. У 1930 фонды архіва перададзены Цэнтр. дзярж. архіву Кастр. рэвалюцыі (знаходзіўся ў Магілёве). У 1938 адноўлены як Магілёўскі абл. архіў. На 1.1.1941 у архіве зберагалася каля 1300 фондаў, 650 тыс. адзінак захоўвання. У час 2-й сусв. вайны большасць фондаў загінула, страчаны ўвесь навук.-даведачны апарат, частка дакументаў вывезена гітлераўцамі ў Рыгу. У 1943 архіў аднавіў дзейнасць. На 1.1.1997 у архіве 2440 фондаў, 436 185 адзінак захоўвання з 1917. На зберажэнні дакументы, што ўтварыліся ў працэсе дзейнасці мясц. органаў улады, устаноў, прадпрыемстваў, што дзейнічалі на тэр. сучаснай Магілёўскай вобл. У архіве прадстаўлены матэрыялы ўстаноў першых гадоў сав. улады, пра арганізацыю і дзейнасць рэв. к-таў, пра гісторыю с.-г. і культ. будаўніцтва ў вобласці, пра прамысл. развіццё і нар. адукацыю, навуку, прафс. рух і інш. Дакументы на бел., рус., ням., польск. і яўр. мовах.

Аддзелы: камплектавання, ведамасных архіваў і справаводства; забеспячэння захаванасці дакументаў і фондаў; аўтаматызацыі інфарм.-пошукавых сістэм; выкарыстання дакументаў; навук.-тэхн. апрацоўкі дакументаў. *Г.І.Жаваранкава.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў МІ́НСКАЙ ВО́БЛАСЦІ. Засн. ў Мінску ў 1923 як частка сховішча Цэнтр. архіва БССР, з 1927 Мінскі гіст. архіў, з 1936 Мінскае аддзяленне цэнтр. дзярж. архіваў БССР, з 1938 Мінскі абл. архіў. На 1.7.1938 на захаванні лічылася 1088 фондаў, больш за 1 млн. спраў. Захоўваліся дакументы губ., пав., валасных органаў улады і кіравання, гасп., фін., паліцэйскіх, судовых, культ.-асв. і інш. устаноў Мінскай губ. за 1793—1918, дакументы сав. перыяду. У час 2-й сусв. вайны дакументы размеркаваны па розных памяшканнях г. Мінска, значная частка іх страчана. У ліп. 1944 архіў аднавіў дзейнасць. У 1964 дакументы дарэв. перыяду перададзены ў Цэнтр. дзярж. гіст. архіў. На 1.1.1997 у архіве 5967 фондаў, 1 237 986 спраў. Зберагае дакументы органаў дзярж. улады і кіравання, прафс., грамадскіх і каап. арг-цый, устаноў адукацыі, аховы здароўя, сац. забеспячэння, статыстыкі, судоў і пракуратуры, прадпрыемстваў, арг-цый прам-сці і сельскай гаспадаркі і інш. Сярод іх пастановы ЦВК БССР і рашэнні па моўнай палітыцы, пратаколы выканкомаў сельскіх і раённых Саветаў пра раскулачванні і высяленні, спісы высланых з тэр. вобласці, дакументы Надзвычайных дзярж. камісій па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў ням.-фаш. захопнікаў і прычыненых імі страт на тэр. Мінскай вобл., сучасныя дакументы і фонды асабістага паходжання. У 1996 архіву перададзены дакументы былога парт. архіва Мінскага абкома КПБ. Дакументы на бел., рус., польск., ням. і яўр. мовах.

Аддзелы: уліку і забеспячэння захаванасці дакументаў; камплектавання, ведамасных архіваў і справаводства; інфарм.-пошукавых сістэм, выкарыстання дакументаў; навук.-тэхн. апрацоўкі дакументаў. *Г.І.Ляшук.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў РАСІ́ЙСКАЙ ФЕДЭРА́ЦЫІ. Створаны ў 1992 у Маскве на базе Цэнтр. дзярж. архіва Кастр. рэвалюцыі, вышэйшых органаў дзярж. улады і органаў дзярж. кіравання СССР (ЦДАКР СССР) і Цэнтр. дзярж. архіва РСФСР (ЦДА РСФСР). Захоўваецца 3139 фондаў, 5,2 млн. спраў (1997). Сабраны матэрыялы па гісторыі рэв., грамадскага і нац.-вызв. руху народаў Рас. імперыі ў 19 — пач. 20 ст. Сярод іх

дакументы Следчай камісіі Вярх. крымінальнага суда па справе дзекабрыстаў, 3-га аддзялення «ўласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі», Дэпартамента паліцыі, МУС, Маскоўскага і Пецярбургскага ахоўных аддзяленняў і інш. Ёсць дакументы Часовага ўрада, фонды па выбарах ва Устаноўчы сход, матэрыялы пра Кастр. паўстанне 1917. Зберагаюцца дакументы з'ездаў Саветаў, фонды ВЦВК, СНК, наркаматаў і мін-ваў СССР і РСФСР і інш. Вял. Айч. вайна 1941—45 адлюстравана ў лістах з фронту і на фронт, ваен. карэспандэнцыях, зводках Саўінфармбюро, тэкстах радыёперадач і інш. Сярод дакументаў гэтага перыяду — фонд Надзвычайнай дзярж. камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў ням.-фаш. захопнікаў на часова акупіраванай тэр. СССР, матэрыялы Нюрнбергскага і Токійскага працэсаў над гал. ваен. злачынцамі 2-й сусв. вайны. Зберагаюцца мікрафотакопіі дакументаў па гісторыі Расіі і СССР, атрыманыя з замежных архіваў. Захоўваюцца фонды б. Рускага замежнага гіст. архіва, перададзенага Чэхаславакіяй у 1945. Сабрана калекцыя перыяд. выданняў, лістовак, плакатаў, картаў. На падставе дакументаў архіва падрыхтаваны шматлікія дакумент. выданні. *В.Дз.Селяменеў.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ БЮДЖЭ́Т, гл. *Бюджэт дзяржаўны.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ВО́ДНЫ КАДА́СТР, гл. *Водны кадастр.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ВЫШЭ́ЙШЫ АТЭСТАЦЫ́ЙНЫ КАМІТЭ́Т РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, гл. *Вышэйшы атэстацыйны камітэт Рэспублікі Беларусь.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ГА́НДАЛЬ, гл. ў арт. *Гандаль.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ГІСТАРЫ́ЧНЫ АРХІ́Ў ЛІТВЫ́ ў Вільнюсе. Утвораны ў 1957 як Цэнтральны дзярж. гіст. архіў Літ. ССР, які разам з інш. захоўваў дакументы *Віленскага цэнтральнага архіва старажытных актаў*. З 1990 сучасная назва. Захоўвае каля 900 фондаў, больш за 1,2 млн. спраў (1987). Зберагае крыніцы, якія маюць важнае значэнне для вывучэння гісторыі Беларусі. Сярод дакументаў фонды *Трыбунала Вялікага княства Літоўскага*, Радзівілаўскай камісіі, Таварыства сяброў навукі ў Вільні, управління Віленскай навуч. акругі, калекцыі дакументаў Віленскай рымска-каталіцкай мітрапаліцкай курыі, Віленскай евангелісцка-лютэранскай калегіі, *Віленскай археаграфічнай камісіі*, Віленскага Святадухаўскага манастыра, фамільныя зборы магнацкіх родаў Агінскіх, Друцкіх-Любецкіх, Радзівілаў, Сапегаў, Тышкевічаў і інш. Пераважную частку архіўных збораў складаюць сац.-эканам. і грамадска-паліт. матэрыялы — інвентары, люстрацыі маёнткаў, ляснiцтваў, старостваў, дакументы і вопісы актавых кніг земскіх і гродскіх судоў (Брэсцкага, Лідскага, Мінскага), кнігі Гродзенскай эканоміі, следчыя дакументы па справах філаматаў, «Братняга саюза літоўскай моладзі», удзельнікаў паўстанняў 1830—31 і 1863—64, дакументы Віленскага ген.-губернатарства, Літоўскай, Віленскай, часткова Ковенскай, Аўгустоўскай і Сувалкаўскай губ., матэрыялы пра паўстанне 1794, вайну 1812, сял. рэформу 1861, сталыпінскія агр. рэформы, пра народніцкі і с.-д. рух, рэвалюцыю 1905—07, пра бел. газеты «Мужыцкая праўда», «Наша доля», «Наша ніва», дакументы пра жыццё і дзейнасць Я.Чачота, К.Каліноўскага, В.Дуніна-Марцінкевіча, К.Каганца, Я.Коласа, Я.Купалы, Цёткі, матэрыялы (часам цэлыя асабістыя фонды) даследчыкаў бел. культуры А.Кіркора, Я.Карловіча, Е.Раманава, Я.Карскага і інш. З нарматыўных матэрыялаў захоўваюцца старадрукаваныя кнігі, эпісталярная спадчына, зборнікі літ. і публіцыстычна-паліт. твораў 17—18 ст. з рэлігійна-панегірычнымі вершамі. барочнай сатырай, сеймавымі прамовамі і інш.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ДАГАВО́Р 1955 аб аднаўленні незалежнай і дэмакратычнай Аўстрыі. Заключаны 15.5.1955 у Вене СССР, ЗША, Вялікабрытаніяй і Францыяй з аднаго боку і Аўстрыяй — з другога. Набыў сілу 27.7.1955. Уключае абавязкі вял. дзяржаў паважаць незалежнасць і тэр. цэласнасць Аўстрыі ў граніцах на 1.1.1938, забараняе далучэнне Аўстрыі да Германіі (аншлюс), абавязвае ўрад Аўстрыі не дапускаць дзейнасці фаш. арг-цый і забяспечваць дэмакр. свабоды. 26.10.1955 аўстр. парламент прыняў канстытуцыйны закон аб пастаянным нейтралітэце Аўстрыі.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ДВАРА́НСКІ ЗЯМЕ́ЛЬНЫ БАНК, гл. *Дваранскі зямельны банк.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ДЖАЗ-АРКЕ́СТР БССР, першы прафесійны джазавы калектыў Беларусі. Створаны ў 1939 у Беластоку як Беластоцкі тэатралізаваны джаз Ю.*Бяльзацкага*, з 1.1.1940 Дзярж. джаз-аркестр пад кіраўніцтвам Э.*Рознера*. Адзін з лепшых джаз-аркестраў б. СССР 1940-х г. У складзе аркестра напачатку пераважалі прафес. музыканты — эмігранты з краін Зах. Еўропы, у асн. з Польшчы. Першыя канцэрты адбыліся ў Мінску ў крас. 1940, потым у Маскве, у т-ры саду «Эрмітаж» і інш. У складзе аркестра ў розны час працавалі спевакі Р.Камінская (жонка Рознера), З.Ларчанка, Л.Лямпель, А.Гольдберг, кампазітар і спявак А.Гарыс, трубач і паэт Ю.Цэйтлін, тэнар-саксафаніст Т.Лявіцін, скрыпач П.Гофман, піяніст А.Дабрушкес, гітарыст Л.Маркевіч. У рэпертуары пераважалі творы, напісаныя ўдзельнікамі калектыву: «Слава табе, Беларусь!» Бяльзацкага, «Каўбойская», «Мандаліна, гітара і бас», «На палянцы» Гарыса, танга «Навошта смяяцца, калі сэрцу балюча» Рознера (усе на сл. Цэйтліна) і інш. Найб. папулярнасць прынёс аркестру ўдзел у фільме «Канцэрт-вальс» (1941). З пач. Айч. вайны калектыў выступаў на Урале, у Сібіры, Сярэдняй Азіі. У 1942 14 музыкантаў пайшлі на фронт. З канца 1942 аркестр выступаў у вайск. часцях, у т.л. на перадавой, перад войскамі Бел. фронту і інш. У 1944—45 праведзена вял. праца па запісе твораў у выкананні джаз-аркестра на грампласцінкі (усяго 43). У 1946 Рознер і Камінская арыштаваны, у 1947 аркестр расфарміраваны. *Я.З.Басін.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ДАЎ́Г, сума запазычанасці дзяржавы па крэдытных аперацыях і нявыплачаных па іх працэнтах. Узнікае, як правіла, пры неабходнасці фінансавання бюджэтнага дэфіцыту. З улікам сферы размяшчэння падзяляецца на ўнутр. і знешні. Унутраны ствараецца на аблігацыях дзярж. пазык і інш. дзярж. *каштоўных папер*, гарантыях дзяржавы пад каштоўныя паперы, выпушчаныя акц. т-вамі, крэдытах, выдадзеных дзяржаве банкамі і інш. крэдыторамі, нявыплачаных фіз. і юрыд. асобам кампенсацыях і інш. Знешні ўзнікае па ўзятых дзяржавай знешніх крэдытах, гарантыях дзяржавы пад атрыманыя за мяжой крэдыты айч. арг-цыямі, запазычанасці па знешнегандл. аперацыях бюджэтных арг-цый.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ДЭПАРТА́МЕНТ (Department of State), галоўнае знешнепалітычнае ведамства ЗША (з ліп. 1789), якое выконвае функцыі Міністэрства замежных спраў. Узначальваецца дзярж. сакратаром. Юрыдычна з'яўляецца дарадчым органам (Канстытуцыя ЗША ускладвае ажыццяўленне знешняй палітыкі на прэзідэнта). Фактычна дэпартамент плануе і, пасля адабрэння прэзідэнтам і кангрэсам, ажыццяўляе знешнепалітычны курс, нясе адказнасць за яго выкананне. Каардынуе таксама дзейнасць іншых выканаўчых дэпартаментаў, якія датычаць знешняй палітыкі, садзейнічае грамадскаму яе разуменню шляхам інфармацыйных паслуг і публікацый.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ЗАКА́З (дзяржаказ), заданне дзяржавы прадпрыемствам (аб'яднанням) на вытв-сць і пастаўкі якой-н. прадукцыі ў пэўнай колькасці або аб'ёме. У склад Дз.з. могуць уключацца заданні на ўвод у дзеянне вытв. магутнасцей і аб'ектаў сац. сферы за кошт цэнтралізаваных капітальных укладанняў; ён можа размяшчацца на конкурснай аснове і абавязковы для ўключэння ў вытв. план. Пры выдачы Дз.з. прадугледжваецца ўзаемная адказнасць бакоў — выканаўцы і заказчыка; ён у першую чаргу забяспечваецца фін. і матэрыяльнымі рэсурсамі, гарантаваным збытам прадукцыі і інш. льготнымі ўмовамі.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ЗЯМЕ́ЛЬНЫ КАДА́СТР, гл. *зямельны кадастр.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ІНСТЫТУ́Т ТЭАТРА́ЛЬНАГА МАСТА́ЦТВА ў Маскве, назва ў 1922—91 *Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ КА́МЕРНЫ АРКЕ́СТР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Створаны ў 1968 як Мінскі камерны аркестр Бел. філармоніі, з 1989 Дзярж. камерны аркестр БССР, з 1992 сучасная назва. Арганізатар і першы дырыжор А.*Янчанка*. У рэпертуары арыгінальныя творы і перакладжэнні п'ес бел. кампазітараў Л.Абеліёвіча, П.Альхімовіча, А.Багатырова, Г.Вагнера, В.Войціка, Я.Глебава, Э.Зарыцкага, С.Картэса, І.Лучанка, Дз.Смольскага, Р.Суруса і інш., музыка барока, венскіх і інш. класікаў, сучасных замежных кампазітараў. Дзейнасць аркестра спрыяла ўзбагачэнню бел. музыкі камернымі разнавіднасцямі сімфоніі, сюіты, канцэрта і інш. Аркестр часта выступае ў сумесных канцэртах з *Дзяржаўным камерным хорам Рэспублікі Беларусь*, стварае сумесныя праекты («Моцарт і...» і інш. тэматычныя праграмы); удзельнічаў у шматлікіх міжнар. фестывалях у краінах Зах. Еўропы; з ім выступалі сусветна вядомыя музыканты (піяніст Ю.Франс, спявачка К.Рычарэлі і інш.). Маст. кіраўнік і гал. дырыжор аркестра І.Э.Райль (з 1993), дырыжор І.*Праваторaў*, канцэртмайстар М. Штэйн. У розны час у аркестры працавалі дырыжоры Ю.Цырук, І.Галаўчын, А.Палянічка, В.Собалеў, канцэртмайстар А.Крамароў.

Літ.: Агаркава А. Шлях да майстэрства // Мастацтва Беларусі. 1983. № 8.

Г.М.Загародні.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ КА́МЕРНЫ ХОР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Створаны ў 1988 у Мінску пры Бел. філармоніі як Мінскі камерны хор, з 1992 сучасная назва. Арганізатар, маст. кіраўнік і гал. дырыжор І.*Мацюхоў*. Асн. намаганні хору скіраваны на адраджэнне бел. духоўнай музыкі, выкананне лепшых твораў сусв. муз. класікі. У рэпертуары бел. гімны і кантаты 16—18 ст., творы бел. кампазітараў, у т.л. А.Багатырова, І.Лучанка, А.Туранкова, буйныя творы духоўнай музыкі айч. і замежных класікаў і сучасных кампазітараў: І.С.Баха, А.Вівальдзі, Г.Ф.Гендэля, Э.Грыга, А.Лоці, В.А.Моцарта, Д.Скарлаці, Дж.Расіні, Ф.Шуберта, І.Брамса, Г.Пёрсела, П.Хіндэміта, Г.Шутца, П.Чайкоўскага, П.Часнакова, Дз.Бартнянскага, А.Архангельскага, А.Грачанінава, С.Танеева, Р.Шчадрына, С.Сланімскага, Ю.Фаліка і інш. Калектыў — першы выканаўца многіх твораў бел. кампазітараў С.Картэса, В.Капыцько, С.Бельцюкова, А.Бандарэнкі і інш. Выкананне адметае тэхн. майстэрствам, чысцінёй інтанавання, роўным гучаннем, глыбокім пранікненнем у змест твораў. Хор часта выступае ў канцэртах сумесна з *Дзяржаўным камерным аркестрам Рэспублікі Беларусь*, наладжвае дабрачынныя канцэрты, сродкі ад якіх пералічвае на карысць дзяцей, пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы. У выкананні хору запісаны 2 кампакт-дыскі з праграмамі бел. і рус. духоўнай музыкі. Калектыў — удзельнік міжнар. фестываляў у Польшчы (1990, 1995), Нарвегіі (1991, 1992, 1995), Славакіі (1991, 1995), 25-х Агульнаням. дзён Евангельскай царквы ў Мюнхене (1993). З 1991 чл. Еўрап. федэрацыі камерных хароў (Гамбург).

ДЗЯРЖА́ЎНЫ КАМІТЭ́Т АБАРО́НЫ, дзяржаўны орган, створаны 30.6.1941 паводле рашэння Прэзідыума Вярх. Савета СССР, ЦК ВКП(б) і СНК СССР у сувязі з надзвычайным становішчам у Вял. Айч. вайну, каб мабілізаваць сілы для адпору фаш. Германіі. Старшыня І.В.Сталін. Камітэт кіраваў дзейнасцю ўсіх дзярж. ведамстваў і ўстаноў, накіроўваў іх намаганні на больш поўнае выкарыстанне матэрыяльных, духоўных і ваен. магчымасцей краіны для дасягнення перамогі над ворагам. Ён вырашаў пытанні пераводу эканомікі краіны на патрэбы вайны, мабілізацыі людскіх рэсурсаў на патрэбы фронту, падрыхтоўкі рэзерваў і кадраў для ўзбр. сіл і прам-сці, эвакуацыі прам-сці з прыфрантавых раёнаў, пераводу прамысл. прадпрыемстваў у вызваленыя раёны і аднаўлення разбуранай вайной нар. гаспадаркі ў зах. абласцях краіны, устанаўліваў аб'ёмы і тэрміны паставак прам-сцю ваен. прадукцыі і інш. Вышэйшым выканаўчым органам камітэта па аператыўна-стратэгічным кіраўніцтве ўзбр. барацьбой з'яўлялася *Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання.* Распараджэнні к-та былі абавязковыя для сав., дзярж., парт., ваен., гасп., прафсаюзных органаў і ўсіх грамадзян. Скасаваны 4.9.1945.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ КАНТРО́ЛЬ, сістэма кантролю дзярж. органаў за выт., гасп., фін. і інш. дзейнасцю дзярж., грамадскіх і каап. арг-цый, прадпрыемстваў і ўстаноў, выкананнем імі законаў

Дзяржаўны камерны аркестр Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь.

і інш. прававых актаў. Дз.к. за выкананнем рэсп. бюджэту, выкарыстаннем дзярж. уласнасці, выкананнем актаў Прэзідэнта, Нац. сходу, СМ і інш. дзярж. органаў, якія рэгулююць адносіны дзярж. уласнасці, гасп., фін. і падатковыя адносіны, ажыццяўляе *Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь*. Вядучая роля ў Дз.к. належыць Саветам дэпутатаў, якім падкантрольныя ўсе інш. дзярж. органы і службовыя асобы гэтых органаў. Дз.к. за дзейнасцю вышэйшых выканаўчых і распарадчых органаў дзярж. улады ажыццяўляюць *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*, парламент. *Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь* канкралюе дзейнасць дзярж. к-таў, мін-ваў і ведамстваў, якія ў сваю чаргу ажыццяўляюць Дз.к. за дзейнасцю падначаленых ім арг-цый і ўстаноў. Аб'ём кантрольных правоў кожнага звяна Дз.к. вызначаецца законам.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ КАПІТАЛІ́ЗМ, гл. ў арт. *Капіталізм*.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ КРЭДЫ́Т, пазыка, у якой пазычальнікам выступае дзяржава, а крэдыторам фіз. або юрыд. асобы. Ажыццяўляецца гал. чынам праз дзярж. пазыкі, аблігацыі, якія рэалізуюцца насельніцтву.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ЛЯСНЫ́ ФОНД, гл. *Лясны фонд*.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ МАЛАДЗЁЖНЫ ТЭА́ТР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Створаны ў 1984 у Мінску з выпускнікоў Бел. тэатр.-маст. ін-та (розных гадоў), тэатр. навуч. устаноў Масквы, акцёраў Бел. рэсп. т-ра юнага гледача і інш. У 1988 папоўніўся выпускнікамі Бел. тэатр.-маст. ін-та. Адкрыўся 30.4.1986 спектаклем «Гэтыя незразумелыя старыя людзі...» паводле аповесці С.Алексіевіч «У вайны не жаночы твар». Т-р імкнуўся прыцягнуць да сябе ўвагу вастрынёй узнятых сац.-грамадскіх праблем, асэнсаваннем жыццёвых працэсаў сучаснасці, тэатр. сінтэзам розных сродкаў маст. выразнасці, абнаўленнем тэатр. формаў. У яго рэпертуары сучасныя п'есы: «Вепручок» В.Розава, «Рамонт» М.Рошчына, «Зоркі на ранішнім небе» А.Галіна, п'еса-дыялог «Чырвоны куток» М.Разоўскага; адкрыты спектакль-гульня для дзяцей «Неверагодны ілюзіён Эрні» А.Эйкбарна; вырашаны мовай пластыкі «Лёс сабора» паводле рамана В.Гюго «Сабор Парыжскай Божай маці»; інсцэніроўка рамана У.Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», нар. драма Ф.Шылера «Вільгельм Тэль»; монаспектакль паводле кнігі «Патаемнае жыццё Сальвадора Далі, напісанае ім самім»; драма Ж.П.Сартра «Пры зачыненых дзвярах»; трагікамедыя «Запрашэнне на танга» паводле п'есы С.Мрожака «Танга»; фантаст. камедыя «Кентэрвільскі прывід» Л.Еранькова паводле твораў О.Уайльда. У 1984—86 у складзе т-ра працавала група пантамімы «Рух».

У складзе трупы (1997): С.Журавель, У.Емяльянаў, С.Жлан, Г.Лавухіна, В.Ліхадзей, В.Моўчан, А.Унукава, І.Фільчанкоў, А.Хрысціч, А.Шароў і інш. Гал. рэжысёры: Р.Баравік (1985—88), Б.Луцэнка (1988—90), В.Катавішкі (з 1990), гал. мастак З.Марголін (з 1988).

Р.І.Баравік.

Да арт. **Дзяржаўны маладзёжны тэатр Рэспублікі Беларусь**. Сцэна са спектакля «Вільгельм Тэль» Ф.Шылера.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ПО́ЛЬСКІ ТЭА́ТР. Створаны ў ліст. 1939 у Беластоку, у 1940—41 працаваў у Гродне. Адкрыўся 13.3.1940 спектаклем «Каварства і каханне» Ф.Шылера. Заснавальнік і маст. кіраўнік А.*Венгерка*. Сярод пастановак: «Мараль пані Дульскай» Г.Запольскай, «Пажыццёвая рэнта» і «Помста» А.Фрэдры, «Пігмаліён» Б.Шоу, «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага, «Жаніцьба Фігаро» П.Бамаршэ. У складзе трупы акцёры: І.Бароўская, С.Брылінскі, С.Бутрым, Ян Вашчароўскі, М.Гадлеўскі, С.Зніч, Г.Касабуцкая, Т.Манкевіч, Б.Міхальская, Г.Слівінскі, В.Сташэўскі, А.Шаляўскі і інш.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ПО́ЛЬСКІ ТЭА́ТР ЛЯ́ЛЕК БССР. Існаваў у 1939—41. Створаны ў Гродне з акцёраў польск. драм. т-раў. Маст. кіраўнік У.Ярэма. Значную ролю ў станаўленні калектыву адыграла знаёмства з творчасцю Цэнтр. т-ра лялек пад кіраўніцтвам С.*Абразцова*, які ў 1939 гастраліраваў у Беластоку. У пастаноўках выкарыстоўваліся лялькі розных сістэм. У рэпертуары: «Дзед і Жораў» В.Вольскага, «Патапыч» і «Чароўны галёш» Г.Мацвеева, «Чароўная лямпа Аладзіна» Н.Гернет і інш. Спыніў дзейнасць у пач. Айч. вайны.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ САВЕ́Т, 1) вышэйшы законадарадчы орган (1810—1906) і верхняя заканад. палата (1906—17) у Рас. імперыі. Створаны па ініцыятыве М.М.Спяранскага. Складаўся з некалькіх дэпартаментаў і Дзярж. канцылярыі на чале з дзярж. сакратаром. Старшыня і члены Дз.с. прызначаліся царом. Разглядаў унесеныя міністрамі законапраекты да іх зацвярджэння манархам, каштарысы і штаты дзярж. устаноў, скаргі на пастановы дэпартаментаў Сената і інш. органаў. Рэарганізаваны ў 1906 у сувязі з утварэннем *Дзяржаўнай думы*. У яго ўваходзілі члены па прызначэнні цара і члены па выбарах (пароўну). Выбарныя праводзіліся ад духавенства, губ. земскіх сходаў, дваранскіх т-ваў, АН і ун-таў, а таксама ад прам-сці і гандлю (часткова шляхам ускосных выбараў). Разглядаў прынятыя думай законапраекты да іх зацвярджэння імператарам. Фактычна ліквідаваны ў выніку Лют. рэвалюцыі 1917 (юрыдычна скасаваны 24.12.1917). 2) Калегіяльны орган дзярж. улады, які выбіраецца вышэйшым прадстаўнічым органам на Кубе. 3) Вышэйшы выканаўчы орган дзярж. улады ў Кіт. Нар. Рэспубліцы. 4) Назва выканаўчага органа ўлады, у якім старшынствуе манарх, у Даніі, Нарвегіі і шэрагу інш. краін. 5) Вышэйшы орган адм. юстыцыі ў Францыі.

Літ.: Ерошкин Н.П. История государственных учреждений дореволюционной России. 2 изд. М., 1968.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ САКРАТА́Р, адна з вышэйшых службовых асоб у некат. краінах, чл. урада. У ЗША — кіраўнік дзярж. дэпартамента (ведамства замежных спраў), у Вялікабрытаніі — афіц. тытул міністраў (унутр. спраў, абароны і інш.), у Францыі — нам. міністра або кіраўнік ведамства, у Расійскай імперыі з 1810 — нач. Дзярж. канцылярыі (аддзел справаводства ў Дзярж. савеце).

ДЗЯРЖА́ЎНЫ САНІТА́РНЫ НАГЛЯ́Д, сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на прадухіленне і ліквідацыю забруджвання навакольнага асяроддзя шкоднымі прамысл. выкідамі і гасп.-бытавымі адходамі, на аздараўленне ўмоў пра-

цы, папярэджанне інфекцыйных, прафесійных і інш. захворванняў. У яго рэалізацыі ўдзельнічаюць асн. ўстановы сан. службы, у т.л. санітарна-эпідэміялагічныя станцыі. У практыцы сан. нагляду шырока выкарыстоўваюцца лабараторныя метады ацэнкі прафесійнавытв. фактараў. Папярэдні санітарны нагляд накіраваны на кантроль за захаваннем сан. норм і правіл пры праектаванні, будаўніцтве, рэканструкцыі і пуску ў эксплуатацыю прамысл. і с.-г. аб'ектаў, за ўкараненнем у практыку новых тэхнал. працэсаў, новага абсталявання, машын, механізмаў, хім. рэчываў і інш. Бягучы санітарны нагляд кантралюе выкананне сан. заканадаўства на прадпрыемствах, вывучэнне ўмоў працы і захворванняў на прадпрыемствах і ў с.-г. вытв-сці; аказвае дапамогу ў арганізацыі правядзення папярэдніх і перыядычных мед. аглядаў і кантралюе іх якасць; вядзе ўлік, рэгістрацыю і расследаванне прычын прафесійных хвароб; правярае выкананне заканадаўства аб ахове працы жанчын і падлеткаў; распрацоўвае комплексныя планы аздараўленчых мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне ўмоў працы і інш.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ СІМФАНІ́ЧНЫ АРКЕ́СТР РАСІІ. Створаны ў Маскве ў 1936 на аснове 1-й сімф. брыгады Усесаюзнага радыё, пазней наз. Дзярж. сімф. аркестр Саюза ССР, з 1972 акадэмічны, з 1991 сучасная назва. Сярод кіраўнікоў: А.*Гаўк*, Н.*Рахлін*, К.*Іваноў*. З 1965 гал. дырыжор і маст. кіраўнік Я.*Святланаў*. У рэпертуары творы рус. і замежнай класікі, сучасных айч. і замежных кампазітараў. Сярод найб. значных дасягненняў калектыву выкананне ў канцэртах і запіс Анталогіі рус. музыкі, усіх сімфоній Г.Малера і інш. Аркестр — першы выканаўца многіх буйнейшых твораў М.Мяскоўскага, Ю.Шапорына, С.Пракоф'ева, Дз.Шастаковіча, А.Хачатурана, Дз.Кабалеўскага, Г.Свірыдава, Ц.Хрэннікава, Ш.Мшвелідзе, М.Пяйко, А.Пятрова, М.Кажлаева, Я.Раэтса, А.Пярта, С.Слонімскага, С.Цынцадзе і інш. З ім выступалі вядомыя айч. і замежныя музыканты: дырыжоры М.*Галаванаў*, С.*Самасуд*, Я.*Мравінскі*, А.*Мелік-Пашаеў*, Б.*Хайкін*, К.*Кандрашын*, Г.*Раждзественскі*, Э. Клайбер, О.Фрыд, А.Клюітэнс, Г.*Абендрот*, Ф.*Канвічны*, Ш.Мюнш, Л.Мазель, піяністы Л.*Аборын*, Э.*Гілельс*, С.*Рыхтэр*, А.Фішэр, М.*Лонг*, Г.*Чэрны-Стэфаньская*, скрыпачы Л.*Коган*, Д.*Ойстрах*, І.*Менухін*, І.Стэрн і інш. Выкананне аркестра адметнае эмацыянальнасцю, глыбінёй і маштабнасцю гучання, бліскучым майстэрствам і бездакорным пачуццём стылю, высокай культурай і артыстызмам.

Літ.: Сидельников Л. Государственный академический симфонический оркестр Союза ССР. М., 1986.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ СМЫКО́ВЫ КВАРТЭ́Т БССР: Існаваў у 1930-я г. Створаны ў Мінску ў 1934, з 1937 у Бел. філармоніі. У складзе калектыву: А.*Бяссмертны*, С.Жыў (адпаведна 1-я і 2-я скрыпкі), І.Гуральнік (альт), М.Арлоў (віяланчэль). Паводле хадайніцтва ЦВК БССР калектыў атрымаў у карыстанне інструменты з дзярж. калекцыі муз. інструментаў у Маскве: скрыпкі Амаці і Альбані, альт Дэразэ, віяланчэль Клоца. Выступленні адбываліся пераважна ў рабочых і чырвонаармейскіх клубах, навук. і навуч. установах рэспублікі. Аснову рэпертуару складалі творы рус. і зарубежнай класікі. Дзейнасць сталага калектыву спрыяла стварэнню бел. кампазітарамі шэрагу квартэтаў (М.Аладаў, У.Алоўнікаў, М.Крошнер, П.Падкавыраў, В.Яфімаў і інш.).

Літ.: Мастацтва Савецкай Беларусі. Мн., 1976. Т. 1. С. 270. *А.Л.Капілаў.*

Да арт. **Дзяржаўны тэатр лялек Беларусі**. Сцэна са спектакля «Прыгоды бравага салдата Швейка» паводле Я.Гашака



Да арт. **Дзяржаўны тэатр лялек Беларусі**. Сцэна са спектакля «Дзед і Жораў» В.Вольскага.

Да арт. **Дзяржаўны тэатр лялек Беларусі**. Сцэна са спектакля «Званы твайго лёсу» А.Вольскага і П.Макаля.



Да арт. **Дзяржаўны тэатр лялек Беларусі**. Сцэна са спектакля «Сымон-музыка» паводле Я.Коласа.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ СТАНДА́РТ, Дзяржстандарт, ДАСТ, гл. ў арт. *Стандарт*.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ТЭА́ТР ЛЯ́ЛЕК БЕЛАРУ́СІ. Створаны ў 1938 у Гомелі. Адкрыўся 15.7.1938 спектаклем «Па шчупаковай волі» Л.Тарахоўскай, які шмат у чым паўтараў пастаноўку С.*Абразцова*, на рэпертуар і пастановачныя прынцыпы якога т-р пераважна арыентаваўся на першым часе. З 1940 маст. кіраўнік М.Бабушкін, гал. мастак Б.Звінагродскі. Ставіліся пераважна казкі: «Чароўныя падарункі» («Дзед і Жораў») В.Вольскага, «Кот у ботах» Г.Уладычынай, «Вялікі Іван» Абразцова і С.Праабражэнскага, «Падарожжа ў дзіўныя краіны» У.Палякова і інш. У Айч. вайну асн.

трупа т-ра знаходзілася ў Душанбе. Дзейнічала таксама агітбрыгада на чале са Звінагродскім, у праграме — сатыр. сцэнкі і інтэрмедыі. 1.5.1944 т-р аднавіў сваю дзейнасць у Гомелі спектаклем «Вялікі Іван». У першыя пасляваен. гады пераважна аднаўляўся ранейшы рэпертуар. З лепшых новых пастановак: «Канёк-Гарбунок» паводле П.Яршова, «Хрустальны чаравічак» Т.Габэ, «Дзед Мароз» А.Шурынавай і «Чароўны галёш» Г.Мацвеева. У 1949 дзейнасць т-ра была спынена. У 1950 т-р створаны нанава і працуе ў Мінску. Некат. спектаклі 1950-х г. характарызаваліся празмерна дэталізаваным вырашэннем лялькі, імітацыяй ёй чалавека. Пошукі новых выяўл. сродкаў, станаўленне прафес. сцэнаграфічнай культуры т-ра звязаны з дзейнасцю рэж. Анатоля *Ляляўскага* і мастака Л.Быкава. Перакананчае рэжысёрскае прачытанне, цікавае сцэнаграфічнае вырашэнне атрымалі творы бел. драматургіі: «Дзед і Жораў» В.Вольскага, «Граф Глінскі-Папялінскі» А.Вольскага, «Каваль Вярнідуб» паводле А.Якімовіча, «Марынка-крапіўніца» А.Вольскага і П.Макаля, «Сярэбраная табакерка» паводле З.Бядулі, «Ліпавічкі» паводле У.Галубка, «Дзякуй, вялікі дзякуй» і «Скажы сваё імя, салдат» А.Вярцінскага, «Балада пра белую вішню» С.Клімковіч, «Янка-цымбаліст і алавянае царства» Э.Брука і Б.Луцэнкі. У канцы 1960 — 1-й пал. 1970-х г. адраджаецца традыцыя пастановак для дарослых, распачатая ў 1950-я г. спектаклямі «Краса ненаглядная» Я.Спяранскага і «Кароль-Алень» паводле К.Гоцы. Сярод іх: «Чортаў млын» і «Боская камедыя» І.Штока, «Цудоўная Галатэя» С.Дарваша і Б.Гадар, «Клоп» У.Маякоўскага, «Да трэціх пеўняў» В.Шукшына, «Прыгоды бравага салдата Швейка» паводле Я.Гашака. Творчасць т-ра 2-й пал. 1970—80-х г. адметная зваротам да новых выяўл. сродкаў, у спектаклях разам з лялькамі выступаюць акцёры ў жывым плане. Імкненне да сінтэзу разнастайных сцэн. сродкаў выявілася ў спектаклях «Крэсіва» Спяранскага, «Сланяня» Уладычынай, «Арэшак» Р.Аляксандравай, «Зорны хлопчык» паводле О.Уайльда, «Ляўша» паводле М.Ляскова, «Салавей» паводле Х.К.Андэрсена і інш. Творчае абліччa т-ра 1990-х г. вызначаюць спектаклі, пастаўленыя рэж. Аляксеем *Ляляўскім*: «Майстар і Маргарыта» паводле М.Булгакава, «Бура» У.Шэкспіра, «Сымон-музыка» паводле Я.Коласа, «Папялушка, ці Перамога Дабрачыннасці» Ж.Маснэ, «Цар Ірад» у апрацоўцы Г.Барышава і інш.

У складзе трупы (1997): засл. арт. Беларусі У.Уласаў, У.Грамовіч, А.Казакоў, мастак па

Да арт. **Дзяржаўны тэатр лялек Беларусі.** Сцэна са спектакля «Балада пра белую вішню» С.Клімковіч.

ляльках засл. работнік культ. А.Нікалайчык. У 1976—96 гал. мастак А.Фаміна.

М.А.Каладзінскі.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ТЭА́ТР МУЗЫ́ЧНАЙ КАМЕ́ДЫІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Створаны ў Мінску ў 1970, адкрыты 17.1.1971 пастаноўкай муз. камедыі «Пяе «Жаваранак» Ю.Семянякі. Напачатку ў рэпертуары пераважалі спектаклі паводле твораў сучасных рас. аўтараў: «Чацвёра з вуліцы Жанны» А.Сандлера, «Вяселле ў Малінаўцы» Б.Аляксандрава, «Вольны вецер» І.Дунаеўскага, «Пацалунак Чаніты» Ю.Мілюціна, «Хітрамудрая закаханая» А.Рабава, «Бабскі бунт» Я.Пцічкіна і інш. Паступова фарміраваўся нац. рэпертуар. Пастаўлены яркі, жыццярадасны спектакль «Паўлінка» (паводле Я.Купалы), аперэта-вадэвіль «Тыдзень вечнага кахання» Семянякі, муз. камедыі «Несцерка» і «Судны час» Р.Суруса, «Рэпартаж з пекла» і «Мільянерка» (паводле Б.Шоу) Я.Глебава, «Дзяніс Давыдаў» А.Мдывані, «Джулія» (паводле С.Моэма) і «Шклянка вады» У.Кандрусевіча. Сярод класічных аперэт найб. вылучаюцца «Сільва», «Марыца», «Баядэра» і «Прынцэса цырка» І.Кальмана, «Цыганскае каханне» і «Вясёлая ўдава» Ф.Легара, «Лятучая мыш», «Ноч у Венецыі» і «Цыганскі барон» І.Штрауса, а таксама творы сучасных рас. і замежных аўтараў — «Мая цудоўная лэдзі» Ф.Лоу, «Гора ад розуму» А.Фельзера, «О, мілы друг» В.Лебедзева, «Сірано» С.Пажлакова, «Гуляем у Прынца і Жабрака» А.Журбіна, «Халопка» М.Стрэльнікава, «Хэло, Долі!» Дж.Германа, «Капялюш Напалеона» О.Штрауса, камічная опера «Viva la mamma!, ці Пікантныя кашмары тэатральнага жыцця» Г.Даніцэці, фольк-опера «Клоп» (паводле У.Маякоўскага) У.Дашкевіча. З пач. 1990-х г. новага этапу развіцця дасягнула балетная трупа т-ра, абноўленая і павялічаная пераважна за кошт выпускнікоў Дзярж. харэаграфічнага каледжа. Пастаўлены шэраг балетаў, у т.л. «Штраусіяна» на муз. І.Штрауса, «Іспанскі дывертысмент» (муз. народная), «Шэхеразада» на муз. М.Рымскага-Корсакава, «Дон Кіхот» Л.Мінкуса, «Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ — Р.Шчадрына, «Зачараваны прынц» па матывах «Шчаўкунка» на муз. П.Чайкоўскага. Вял. ўвагу калектыў т-ра аддае фарміраванню рэпертуару для дзяцей. Сярод дзіцячых спектакляў: «Зайка-зазнайка» і «Сцяпан — вялікі пан» Ю.Семянякі, «Беласнежка і сем гномаў» Э.Калманоў-

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь. Сцэна са спектакля «Хэло, Долі» Дж.Германа. 1992.

скага, «Трубадур і яго сябры» Г.Гладкова, «Залатое курання» У.Уланоўскага, «Пэпі» Дашкевіча і інш. Гал. рэжысёр — маст. кіраўнік т-ра Б.Лагода (з 1997), гал. дырыжор М.Сінькевіч (з 1997), гал. мастак *Я.Ждан* (з 1995), гал. балетмайстар Н.*Дзьячэнка* (з 1993), гал. хармайстар С.Пятрова (з 1997). У складзе трупы (1997): нар. арт. Беларусі Н.Гайда, В.Мазур, засл. арт. Беларусі А.Ісаеў, Г.Казлоў, П.Рыдзігер, В.Фаменка, засл. арт. Расіі А.Кузьмін, Н.Равінская, засл. арт. Украіны А.Ранцанц, балетмайстры-рэпетытары нар. арт. Расіі М.Подкіна, засл. арт. Беларусі Л.Чахоўскі, артысты балета лаўрэаты міжнар. конкурсаў Ю.Дзятко і К.Кузняцоў. У розны час у т-ры працавалі: дырыжоры І.Абраміс, П.Кірыльчанка, А.Лапуноў, балетмайстры С.Дрэчын, В.Бутрымовіч, артысты Дз.Іванова, Ю.Лазоўскі, К.Лосеў, Р.Харык, В.Шаўкалюк, Л.Рабушка, рэжысёры Б.Утораў, В.Цюпа, С.Штэйн, А.Барсегян, Р.Вікцюк, Ю.Аляксандраў, мастакі Я.Чамадураў, А.Марозаў, А.Грыгар'янц, Б.Герлаван, У.Жданаў і інш. У 1991 на базе т-ра створаны дзіцячы муз. тэатр-студыя «Казка» (маст. кіраўнік Г.Аляксандраў), сярод спектакляў якога найб. вылучыліся оперы «Гісторыя Кая і Герды» С.Баневіча, «Дзіцячы альбом» на муз. Чайкоўскага, «Вясновая песня» і мюзікл «Прыгоды ў замку Алфавіт» В.Войціка.

Будынак т-ра (адкрыты 15.10.1981, арх. А.Ткачук, У.Тарноўскі) мае асіметрычную кампазіцыю з раўназначнымі фасадамі, абумоўленую яго размяшчэннем у сістэме гістарычна складзенай забудовы. У прыбудаваным аб'ёме размешчаны амфітэатр, зала на 800 месцаў, развітая група сцэнічных памяшканняў. Гал. ўваход акцэнтаваны парадным парталам са скульпт. групай «Музы» (бронза, скульпт. Л.Зільбер). Інтэр'ер дэкарыраваны светлым мармурам, гіпсавымі ўстаўкамі, залацістым шклом, латунню. У глядзельнай зале габеленавая заслона (маст. А.Кішчанка і А.Бельцюкова), дэкар. рэльефы на партальнай сцяне і калонах (арх. Ткачук, скульпт. Ю.Якубовіч).

Будынак **Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь.**

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь. Сцэна са спектакля «Штраусіяна». 1992.

Літ.: Государственный театр музыкальной комедии Белорусской ССР. Мн., 1991; Ю ў ч а н к а Н.А. Музычная камедыя і аперэ-

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь. Сцэна са спектакля «Джулія» У.Кандрусевіча. 1991.

та // Музычны тэатр Беларусі 1960—1990. Мн., 1996.

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ТЭА́ТР О́ПЕРЫ І БАЛЕ́ТА РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, назва ў 1933—96 творчага аб'яднання *Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь*.

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь. Сцэна са спектакля «Мільянерка» Я.Глебава. 1987.

Будынак **Дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа Рэспублікі Беларусь.**

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ХАРЭАГРАФІ́ЧНЫ КАЛЕ́ДЖ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Засн. ў Мінску ў 1945 як Бел. дзярж. харэаграфічнае вучылішча, з 1996 сучасная назва. Яго стварэнне падрыхтавана развіццём прафес. харэаграфічнай адукацыі на Беларусі, якая бярэ пачатак ад харэаграфічнага класа пры Бел. муз. тэхнікуме (з 1928), Бел. студыі оперы і балета (1930—33), балетнай школы пры Дзярж. т-ры оперы і балета БССР (з 1934), харэаграфічнага аддзялення ў тэатр. вучылішчы (з 1939). Арганізатар і першы маст. кіраўнік З.*Васільева* (да 1949). У 1996/97 навуч. г. працавала аддзяленне класічнага танца з 8-гадовым тэрмінам навучання (прымаюцца дзеці на базе 4 класаў агульнаадук. школы). Навучанне дзённае. Да 1992 існавала таксама аддзяленне нар. танца з 5-гадовым тэрмінам навучання. Сярод педагогаў: А.*Калядэнка*, В.Лапо, К.*Малышава*, Н.Нікалаева, М.*Пятрова*, Г.Сінельнікава, В.*Швяцова*. Маст. кіраўнік Ю.*Траян* (з 1995). У розны час у каледжы працавалі: маст. кіраўнікі А.*Нікалаева*, І.*Савельева*; педагогі Л.*Бржазоўская*, Я.*Глінскіх*, В.*Давыдаў*, В.Дудко, А.*Карзянкова*, У.*Камкоў*, Р.*Красоўская*, М.*Красоўскі*, Н.Малахава, Н.*Младзінская*, Н.*Паўлава*, Р.Сінёва, Л.*Чахоўскі* і інш. У 1995—96 у каледжы выдаваўся час. «Вестник» (па праблемах балетнага мастацтва; выйшла 8 нумароў).

Да арт. **Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР.** Сцэна са спектакля «Глыбокія карэнні» Дж.Гоу і А. Д'Юса.

Літ.: Чурко Ю.М. Белорусский балет. Мн., 1966. *А.І.Калядэнка.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫ ЯЎРЭ́ЙСКІ ТЭА́ТР БССР. Існаваў у 1926—49 у Мінску. Створаны з выпускнікоў Яўр. студыі ў Маскве (1922—26). Узначальвалі т-р М.*Рафальскі* (1926—37) і В.*Галаўчынер* (1938—46). Маст. аблічча т-ра вызначалі спектаклі, створаныя паводле твораў яўр. класікі: Шолам-Алейхема («Тэўемалочнік»), А.Гольдфадэна («Суламіф»), І.Аксенфельда («Рэкрут»), М.Мойхер-Сфорыма («Маленькі чалавечак»). Значнае месца ў рэпертуары займала замежная класічная драматургія — п'есы У.Шэкспіра, Мальера, Лопэ дэ Вэгі, К.Гальдоні, Б.Шоу. Т-р імкнуўся папаўняць рэпертуар тагачаснымі нац. п'есамі: «Гірш Лекерт» А.Кушнірова, «Бойтра» М.Кульбака, «Сям'я Авадзіс» П.Маркіша і інш. У 1930-я г. пастаўлены п'есы М.Горкага («Фальшывая манета», упершыню на сав. сцэне), А.Карнейчука, А.Арбузава, М.Пагодзіна. Тэатр героіка-рамантычнага кірунку. У яго пастаноўках — тэатральна яркіх, дынамічных, маляўнічых, насычаных музыкай, танцамі, нар. песнямі — яркая відовішчнасць спалучалася з псіхалагізмам. У Айч. вайну т-р працаваў у Новасібірску. З 1946 у Мінску. У рэпертуары п'есы, прысвечаныя вайне: «Паўстанне ў гета» Маркіша, «Помста» І.Левіна, «Так і будзе» К.Сіманава і спектаклі паводле твораў нац. класікі. Сярод акцёраў т-ра: засл. арт. БССР Ю.Арончык, М.Моін, М.Сокал, А.Трэпель. У канцы 1940-х г. т-р абвінавацілі ў фармалізме, касмапалітызме, нацыяналізме і ў 1949 расфарміравалі.

ДЗЯРЖА́ЎНЫХ СЯЛЯ́Н РЭФО́РМА 1866—67, сістэма мер царскага ўрада, накіраваных на ліквідацыю феад. залежнасці дзярж. сялян у Еўрап. Расіі. У рас. губернях, на Левабярэжнай і Паўд. Украіне праводзілася паводле закону ад 24.11.1866, у Беларусі, Правабярэжнай Украіне і Літве адпаведна закону ад 16.5.1867. Землеўладкаванне дзярж. сялян было арганізавана на тых жа пачатках, што і б. панскіх сялян у Беларусі, Правабярэжнай Украіне і Літве. Яны былі пераведзены на абавязковы выкуп і прылічаны да разраду «сялян-уласнікаў». За сялянамі замацоўвалі надзелы, што знаходзіліся ў іх пастаянным карыстанні. Сума штогадовых выкупных плацяжоў вызначалася велічынёй штогадовага аброчнага падатку, павялічанага на 10%. Тэрмін пагашэння выкупнога доўгу складаў 46 гадоў. Пазыкі ад казны б. дзярж. сяляне не атрымлівалі. Да зацвярджэння люстрацыйных актаў яны абавязаны былі па-ранейшаму плаціць аброчны падатак, а зямельныя надзелы заставаліся толькі ў іх карыстанні. У выніку рэформы надзельнае землеўладанне б. дзярж. сялян павялічылася ў 5 зах. губернях на 613 656 дзес. і

перавышала надзелы былога прыватнаўласніцкага сялянства ў разліку на рэвізскую душу ў сярэднім на 24,5%, на двор — на 20,8%. Выкупныя плацяжы б. дзярж. сялян адпавядалі мясц. рыначным цэнам на зямлю і былі прыкметна ніжэйшыя, чым у б. панскіх сялян. *В.П.Панюціч.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ ДАХО́ДЫ, фінансавыя сродкі, якія паступаюць у дзярж. *бюджэт* і складаюць даходную частку цэнтралізаваных фін. рэсурсаў дзяржавы. Выкарыстоўваюцца дзяржавай для ажыццяўлення сваіх функцый. Утвараюцца ў асноўным за кошт чыстага даходу ў форме падатку з абароту, плацяжоў прадпрыемстваў і арг-цый з прыбытку, мытных даходаў, узносаў па сац. страхаванні, падаходнага падатку. Крыніцамі Дз.д. з'яўляюцца таксама даходы ад жыллёвага фонду, лясны даход, выручка ад рэалізацыі безгаспадарчай і канфіскаванай маёмасці, незапатрабаваных грузаў і паштовых адпраўленняў, маёмасці прадпрыемстваў, што ліквідуюцца, арг-цый і ўстаноў, даходы ад платных паслуг. Да Дз.д. належаць паступленні сум, якія перавышаюць даходы над расходамі па спец. сродках бюджэтных устаноў, ад арэндnай платы і інш. Адна з формаў папаўнення Дз.д. — замежныя *пазыкі*.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ ІНСПЕ́КЦЫІ, спецыяльныя дзярж. органы, якія ажыццяўляюць функцыі нагляду і кантролю за выкананнем прадпрыемствамі, арг-цыямі, установамі, службовымі асобамі і грамадзянамі пэўных правіл, устаноўленых прававымі актамі: санітарных, ветэрынарных, проціпажарных, правіл гандлю, рыбнай лоўлі, руху аўтамототранспарту, тэхнікі бяспекі і да т.п. У Рэспубліцы Беларусь Дз.і. з'яўляюцца самаст. сістэмамі органаў або ўключаюцца ў сістэму мін-ва ці дзярж. к-та (напр., гандл. інспекцыя, дзярж. аўтаінспекцыя і інш.). Кантрольныя і наглядальныя паўнамоцтвы Дз.і. пашыраюцца на ўсе прадпрыемствы, установы і арг-цыі, незалежна ад іх ведамаснай падначаленасці. Службовыя асобы Дз.і. правамоцныя наведваць аб'екты, якія кантралююць, патрабаваць прад'яўлення неабходных дакументаў, праводзіць праверкі, ужываць у неабходных выпадках меры адм. ўздзеяння (забараніць або абмежаваць эксплуатацыю аб'екта, прыпыніць работы, адхіліць асобу ад работы, накласці штраф, вынесці папярэджанне і г.д.). На Беларусі дзейнічаюць Дз.і.: у галіне выкарыстання паліўна-энергет. і інш. матэрыяльных рэсурсаў; у галіне фінансаў, буд-ва, гандлю, санітарыі, стандартызацыі, па ахове нетраў, каранціне раслін, якасці прадукцыі, па котлаглядзе, рыбаахове, прабірным наглядзе і інш. У функцыі тэхн. і сан. Дз.і. увахо-дзіць таксама выдача дазволаў на пуск у эксплуатацыю прамысл. прадпрыемстваў, іх цэхаў і інш. аб'ектаў.

Разам з Дз.і. дзейнічаюць тэхн. інспекцыі працы і прававая інспекцыя працы прафсаюзаў, на якіх ускладзены кантроль за выкананнем заканадаўства аб працы і правіл па ахове працы і тэхнікі бяспекі.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ КАМІТЭ́ТЫ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, цэнтральныя органы кіравання Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць функцыі міжгалінавага кіравання, у асобных выпадках галіновае кіраванне нар.-гасп. і сац.-культ. комплексамі. Яны маюць права выдаваць нарматыўныя акты, абавязковыя для выканання ўсімі мін-вамі, ведамствамі і арг-цыямі. Уваходзяць у склад Урада — СМ Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (дадатку ад 14.1.1997) утвораны Дз. к. Р.Б.: па друку; па авіяцыі; па справах моладзі; мытны; падатковы; пагран. войск; па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі; па энергазбяражэнні і энергет. наглядзе; па архівах і справаводстве; патэнтны; па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі; па гідраметэаралогіі; вышэйшы атэстацыйны; па навуцы і тэхналогіях; па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ КАШТО́ЎНЫЯ ПАПЕ́РЫ, дзяржаўныя абавязацельствы, якія афармляюцца ў выглядзе пазыковых каштоўных папер. Выпускаюцца цэнтр. і дзярж. ўстановамі і мясц. органамі ўлады з мэтай мабілізацыі грашовых сродкаў для фінансавання дзярж. доўгу, бюджэтнага дэфіцыту, мэтавых агульнанац. і рэгіянальных праграм, забеспячэння камерц. банкаў ліквіднымі актывамі, падтрымкі ўстаноў і арг-цый сац. накіраванасці, рэгулявання грашовай масы ў абарачэнні. Першаснае размяшчэнне Дз.к.п. ажыццяўляецца Нац. (Цэнтр.) банкам праз сетку дылераў (камерцыйныя банкі, фін. кампаніі і г.д.) шляхам правядзення аўкцыёнаў, адкрытага продажу або на падставе індывід. перагавораў. Існуюць рыначныя і нярыначныя Дз.к.п. Рыначныя — казначэйскія вэксалі, ноты, аблігацыі, якія свабодна прадаюцца і купляюцца на другасным рынку каштоўных папер, значная частка іх абароту прыпадае на пазабіржавы рынак; асн. трымальнікі — крэдытна-фін. ўстановы, інстытуцыянальныя інвестары (пенсіённыя, страхавыя, інвестыцыйныя фонды і г.д.), прыватныя асобы. Нярыначныя — ашчадныя аблігацыі і сертыфікаты, некаторыя віды пенсіённых аблігацый, якія размяшчаюцца мясц. органамі ўлады або рэалізуюцца за мяжой; прызначаюцца гал. чынам для размяшчэння сярод насельніцтва і не могуць свабодна пераходзіць ад аднаго трымальніка да другога. Парадак і памер выплат даходаў па Дз.к.п. вызначаюцца працэнтнымі стаўкамі, *дысконтам*, правядзеннем выйгрышных пазык. На Беларусі ў абароце знаходзяцца дзярж. кароткатэрміновыя аблігацыі, казначэйскія вэксалі, кароткатэрміновыя абавязацельствы Нац. банка, трымальнікамі якіх з'яўляюцца выключна юрыд. асобы; імянныя прыватызацыйныя чэкі.

Л.І.Шмыгава.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ ПАДА́ТКІ, гл. ў арт. *Падаткі*.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ ПРАЦО́ЎНЫЯ РЭЗЕ́РВЫ, гл. ў арт. *Працоўныя рэзервы*.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ ПРЭ́МІІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, дзяржаўныя ўзнагароды за творчыя дасягненні ў галіне навукі і тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Устаноўлены ЦК КПБ і СМ БССР па л-ры, музыцы і мастацтве ў 1965, па журналістыцы ў 1967, па архітэктуры ў 1968, л-ры і мастацтве для дзяцей і юнацтва, у галіне навукі і тэхнікі ў 1971. Да 1992 называліся Дзярж. прэміі БССР, з 1992 — Дзярж. прэміі Рэспублікі Беларусь. Зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 6.5.1996. Прысуджаюцца раз у 2 гады кожны цотны год. Асобам, якія атрымалі Дзярж. прэмію, прысвойваецца званне «Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь», уручаецца дыплом, ганаровы знак лаўрэата, грашовая прэмія. У галіне навукі і тэхнікі прысуджаецца за выдатныя навук. дасягненні, якія адпавядаюць сусв. ўзроўню і садзейнічаюць развіццю гуманіт., прыродазнаўчых і тэхн. навук. Прысуджаецца 12 Дзярж. прэмій, у т.л. ў галіне гуманіт. і сац. навук — 2, прыродазнаўчых навук — 5, тэхнікі — 3 і за падручнікі — 2. У галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры прысуджаюцца за таленавітыя, глыбокія па змесце і адметныя па форме творы л-ры, выяўл. мастацтва, архітэктуры, тэатр. пастаноўкі, кінафільмы, муз. творы, выканаўчае майстэрства, якія робяць значны ўклад у бел. нац. культуру, развіваюць маст. традыцыі і садзейнічаюць устанаўленню агульначалавечых каштоўнасцей і ідэй гуманізму, а таксама за маштабныя публікацыі ў галіне журналістыкі, даследчыя работы ў галіне літ.-знаўства і мастацтвазнаўства, тэорыі і гісторыі мастацтва. За творы паэзіі і драматургіі прысуджаецца 1 прэмія імя Я.Купалы, за творы прозы, працы ў галіне літ.-знаўства і крытыкі — 1 прэмія імя Я.Коласа, за творы л-ры і мастацтва для дзяцей і юнацтва — 1 прэмія, за працы ў маст. публіцыстыцы — 1 прэмія імя К.Каліноўскага, у галіне журналістыкі — 1 прэмія, за муз. творы і канцэртна-выканаўчую дзейнасць — 2 прэміі, за работы рэжысёраў, дырыжораў, балетмайстраў, хормайстраў, артыстаў, кампазітараў і інш. у пастаноўках тэатраў, кінастудый, на тэлебачанні і радыё — 2 прэміі, за творы жывапісу, скульптуры і інш. выяўл. мастацтва — 2 прэміі, у галіне архітэктуры — 1 прэмія, за даследаванні па тэорыі і гісторыі мастацтва і архітэктуры, а таксама падручнікі для спец. навуч. устаноў па архітэктуры і мастацтвазнаўстве — 1 прэмія. *Г.А.Маслыка.*

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ РАСХО́ДЫ, расходы дзяржавы, звязаныя з ажыццяўленнем яе функцый. Выкарыстоўваюцца як сродак рэгулявання эканомікі і перараз-меркавання нац. даходу. За кошт дзяржавы ажыццяўляюцца буйныя ўкладанні ў развіццё нар. гаспадаркі, фінансаванне праграм сац.-эканам. развіцця, сац. абароны насельніцтва, прыярытэтных кірункаў інвестыцыйнай дзейнасці, знешнеэканам. дзейнасці і інш. Паводле эканам. зместу і ролі ў стварэнні нац. даходу і сукупнага грамадскага прадукту Дз.р. падзяляюцца на расходы ў вытв. сферы, абумоўленыя пашырэннем вытв-сці і ўтварэннем дзярж. рэзерваў, і расходы ў невытв. сферы (сац.-культ. мерапрыемствы, кіраванне і абарона). Дз.р. групуюцца па галіновай і рэгіянальнай прыкметах, па мэтавым прызначэнні (капітальныя ўкладанні, павелічэнне абаротных сродкаў, аператыўныя расходы, заработная плата ў бюджэтных установах і інш.). Па крыніцах фінансавання Дз.р. падзяляюцца на цэнтралізаваныя (дзярж. бюджэт) і дэцэнтралізаваныя (расходы прадпрыемстваў і дзярж. арг-цый), па метадах фінансавання — на ўласныя, бюджэтныя і крэдытныя. У бюджэтных Дз.р. асн. аб'ём займаюць дзярж. датацыі (паліва-энергет. і аграпрамысл. комплексы, транспарт і інш.), дзярж. інвестыцыі (праграмы капітальнага буд-ва, сац. абароны, канверсіі, ліквідацыі выніка́ў стыхійных бедстваў і катастроф і інш.). Гл. таксама *Бюджэт дзяржаўны*, *Датацыя*, *Інвестыцыі*.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ РЭЗЕ́РВЫ, запасы сыравіны і матэрыялаў, паліва, некат. відаў машын і абсталявання, зерня і інш. прадуктовых тавараў, якія ствараюцца і планамерна папаўняюцца дзяржавай, неабходныя для бесперабойнага функцыянавання эканомікі на выпадак стыхійных бедстваў, патрэб абароны і інш., для пераадолення дыспрапорцый, якія могуць узнікнуць у ходзе развіцця нар. гаспадаркі. Дз. р. Рэспублікі Беларусь складаюць асобы цэнтралізаваны фонд дзяржавы, які пастаянна абнаўляецца. Расходаванне Дз.р. дапускаецца ў выключных выпадках толькі па спец. пастановах і распараджэннях урада.

ДЗЯРЖА́ЎНЫЯ СЯЛЯ́НЕ, 1) сельскае феадальна залежнае насельніцтва, якое жыло на дзярж. землях у ВКЛ у 14—18 ст. Узніклі з асабіста вольных сялян-абшчыннікаў і *чэлядзі нявольнай*, пасаджанай на зямлі вял. князя. У склад Дз.с. уваходзілі таксама сяляне-слугі (гл. *Слугі*), *асочнікі*, бортнікі, конюхі і інш. Запрыгонены пры ажыццяўленні *валочнай памеры*. У 17—18 ст. з Дз.с. зліліся ніжэйшыя ваен. слугі, якія жылі на гаспадарскіх землях (баяры). 2) Катэгорыя сельскага насельніцтва ў Рас. імперыі ў 18 — 2-й пал. 19 ст. Вылучаны пры Пятру I з незапрыгоненых *чарнасошных сялян*, *палоўнікаў*, *аднадворцаў* і інш. Жылі на казённых землях, плацілі казне феад. рэнту за карыстанне землямі і лічыліся асабіста вольнымі. Рас. ўрад раздаваў, прадаваў ці здаваў у арэнду дваранам дзярж. маёнткі з Дз.с. Гэта катэгорыя пазней павялічана за кошт сялян секулярызаваных царк. уладанняў і далучаных тэр. (Прыбалтыкі, Украіны, Беларусі, Крыма, Закаўказзя) і інш. У Беларусі і ў інш. зах. рэгіёнах пасля іх далучэння да Рас. імперыі (канец 18 ст.) у катэгорыю Дз. с. уключаны аднадворцы, *панцырныя баяры*, сяляне канфіскаваных маёнткаў, вайск. людзі, *вольныя хлебаробы* і інш. Ва ўмовах заняпаду дзярж. гаспадарак, збяднення і хваляванняў Дз. с. рас. ўлады ў 1830—50-я г. рэарганізавалі дзярж. вёску (у т.л. ў 1837—41 праведзена Кісялёва рэформа). У 1840—50-я г. ў зах. губернях Расіі праведзена люстрацыя (фіксацыя, упарадкаванне павіннасцей) Дз. с. У сярэдзіне 19 ст. яны складалі каля 45% усіх сялян. З 1857 паншчына поўнасцю заменена аброкам, ліквідавана практыка здачы дзярж. маёнткаў у арэнду, зменшаны памеры феад. павіннасцей і павялічаны зямельныя надзелы. *Сялянская рэформа 1861* не пашырылася на Дз.с. Паводле рэформы дзярж. сялян 1867 у Беларусі яны пераводзіліся з аброку на выкуп.

Літ.: Козловский П.Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII — первой половине XIX в. Мн., 1982; Кабузан В.М. Государственные крестьяне России в XVIII — 50-х гг. XIX в.: Численность, состав и размещение // История СССР. 1988. № 1.

ДЗЯРЖА́ЎЦА, службовая асоба ў ВКЛ, кіраўнік, часовы ўладальнік дзярж. маёнтка — *дзяржавы*. Да 16 ст. называўся *намеснікам* або *цівуном*. Прызначаўся вял. князем з шляхты, звычайна пажыццёва. Выконваў гасп., адм.-судовыя функцыі, збіраў падаткі, наглядаў за станам і рамонтам гасп. пабудоў, ваен. умацаванняў, адказваў за забеспячэнне гаспадаркі рабочай сілай. Судзіў вялікакняжацкіх сялян, мяшчан, якія не падлягалі магдэбургскаму праву, шляхту (да 1564). З 16 ст. пашырылася практыка аддачы дзяржавы Дз. «ў заставу» за пэўную суму грошай.

ДЗЯРЖЫ́НСК, горад у Расіі, цэнтр раёна ў Ніжагародскай вобл. Засн. ў 1929. 285,9 тыс. ж. (1994). Порт на р. Ака. Чыг. станцыя. Цэнтр хім. прам-сці (вытв-сць капралактаму, пластмас, аргшкла і інш.), машынабудаванне, лёгкая (у т.л. пянькова-джутавая), харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. НДІ і праектныя ін-ты па распрацоўцы хім. тэхналогій. Драм. і лялечны т-ры.

ДЗЯРЖЫ́НСК, горад абл. падпарадкавання ў Мінскай вобл., цэнтр Дзяржынскага р-на. На чыг. лініі (ст. Койданава) і аўтадарозе Мінск—Баранавічы. За 38 км ад Мінска. 24,6 тыс. ж. (1996).

Вядомы з 12 ст. як г. Крутагор'е. У 12—13 ст. пабудаваны *Койданаўскі замак*. У пісьмовых крыніцах упамінаецца з 1442 як г. Койданава (назва паходзіць ад імя паўлегендарнага татарскага военачальніка Койдана, які нібыта быў тут разбіты ў 13 ст. ці знаходзіўся на службе ў войску ВКЛ у 14 ст.). З 1483 належаў кн. В.М.Вярэйскаму, магнатам Гаштольдам, з 1539 — вял. кн. ВКЛ Жыгімонту I Старому. У 1550—1831 належаў Радзівілам. З 1831 дзярж. маёмасць. Быў буйным цэнтрам кальвінізму, у 17 ст. пабудаваны *Койданаўскі кальвінскі збор*. У 1588 мястэчка. З 1793 у Рас. імперыі, цэнтр воласці Мінскага пав. У вайну 1812 каля Койданава адбылася *Койданаўская бітва 1812*. У 1871 праз мястэчка пракладзена чыгунка. У канцы 19 — пач. 20 ст. 2 вучылішчы, 2 яўр. школы, царква, касцёл, кальвінскі збор, сінагога, мясц. прамысловасць. У 1897 — 4744 ж. У 1899 пабудавана *Койданаўская запалкавая фабрыка «Дружына»*. З 1924 цэнтр *Койданаўскага раёна* (у 1932—37 нац. польскі). У 1932 горад перайменаваны ў Дзяржынск. У 1937—39 у Мінскім р-не, потым цэнтр *Дзяржынскага раёна*. У Вял. Айч. вайну з 28.6.1941 да 7.7.1944 акупіраваны нямецкімі фашыстамі, якія загубілі ў Дз. і раёне 17 606 чал., дзейнічала *Дзяржынскае патрыятычнае падполле*. У 1970 — 11,5 тыс. жыхароў.

Фрагмент забудовы горада **Дзяржынск**.

Прам-сць: маш.-буд. і металаапр. (з-ды доследна-мех., эксперым.-мех., маторарамонтны і інш.), лёгкая (швейная і тэкст. ф-кі, ільнозавод) і харч. Дзейнічае *Дзяржынскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Помнікі архітэктуры — касцёл апекі Божай (2-я пал. 18 ст.), Пакроўская царква (1851). Памятны знак у гонар 850-годдзя заснавання Крутагор'я—Койданава—Дз. (1996). Помнік у гонар вызвалення горада.

Брацкая магіла чырвонаармейцаў, брацкія могілкі сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Гарадзішча жал. веку, эпохі Кіеўскай Русі і позняга феадалізму. *А.І.Валаховіч* (гісторыя).

ДЗЯРЖЫ́НСК, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., на р. Плаў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 80 км на З ад Лельчыц, 287 км ад Гомеля, 89 км ад чыг. ст. Алеўск, 64 км ад прыстані Тураў на Прыпяці. 1112 ж., 420 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Царква.

ДЗЯРЖЫ́НСК, вёска ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр Красноўскага с/с і саўгаса. За 41 км на Пд ад Нароўлі, 119 км ад Гомеля, 40 км ад чыг. ст. Ельск. 153 ж., 57 двароў (1997). Лясніцтва. Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ДЗЯРЖЫ́НСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ, Дзяржынскі антыфашысцкі камітэт «Смерць фашызму». Дзейнічаў са жн. 1941 да ліп. 1944 у г. Дзяржынск і Дзяржынскім р-не ў Вял. Айч. вайну пад кіраўніцтвам Мінскага падп. абкома КП(б)Б і Дзяржынскага падп. райкома КП(б)Б у кантакце з *Мінскім патрыятычным падполлем*. Яднала 120 чал. Першая падп. група створана па ініцыятыве І.А.Жукаўца, Г.В.Будая і П.М.Хмялеўскага. Існавалі групы ў вёсках Вял. Навасёлкі, Кукшавічы, Станькава, Баравое, Касілавічы, Нявелічы, Шацілы і інш. У канцы жн. 1941 створаны Дзяржынскі антыфаш. к-т «Смерць фашызму» ў складзе Будая (кіраўнік), Жукаўца, Хмялеўскага, С.Ф.Юховіча (з вясны 1942). Падпольшчыкі збіралі звесткі аб варожым гарнізоне, карных аперацыях супраць насельніцтва і партызан, забяспечвалі падпольшчыкаў, партыз. сувязных, былых ваеннаслужачых пашпартамі, пропускамі (аўсвайсамі), вялі антыфаш. прапаганду сярод насельніцтва, распаўсюджвалі зводкі Саюзінфармбюро, лістоўкі, газ. «Звязда», збіралі разведданыя для партызан, накіроўвалі да іх людзей, перадавалі зброю, медыкаменты, адзенне, прадукты, сарвалі намер акупантаў стварыць атрады «самааховы», выратавалі больш за 400 чал. ад вывазу ў Германію, палілі і ўзрывалі масты і эшалоны, знішчалі жывую сілу і баявую тэхніку ворага, парушалі тэлеграфна-тэлефонную сувязь і інш. У крас. 1942 на базе некалькіх падп. груп створаны партыз. атрад. Пасля арыштаў у кастр. 1942 к-т перастаў дзейнічаць, большасць падпольшчыкаў перайшла да партызан. *Л.В.Аржаева, А.І.Валаховіч.*

ДЗЯРЖЫ́НСКАЯ Ксенія Георгіеўна (6.2.1889, Кіеў — 9.6.1951), расійская спявачка (сапрана). Нар. арт. СССР (1937). Спевам вучылася ў Пецярбургу і Берліне ў М.Малінгер. У 1915—48 салістка Вял. т-ра ў Маскве. Адна з буйнейшых рас. спявачак, валодала моцным, сакавітым, выразным голасам, роўным ва ўсіх рэгістрах, артыстычнай культурай. Сярод лепшых партый: Ліза, Кума Настасся («Пікавая дама», «Чарадзейка» П.Чайкоўскага), Фяўронія («Паданне пра нябачны горад Кіцеж...» М.Рымскага-Корсакава), Артруда («Лаэнгрын» Р.Вагнера). Першая выканала на сцэне т-ра партыю Турандот («Турандот» Дж.Пучыні). Вядома як выканальніца вак. лірыкі Чайкоўскага, С.Рахманінава. З 1947 праф. Маскоўскай кансерваторыі. Дзярж. прэмія СССР 1943.

ДЗЯРЖЫ́НСКАЯ ГАРА́ (да 1958 Святая гара), найвышэйшы пункт *Мінскага ўзвышша* і Беларусі. Знаходзіцца каля в. Скірмантава, за 20 км на Пн ад г. Дзяржынск, за 30 км на ПдЗ ад г. Мінск. Выш. 345 м над узр. м. Над рэкамі, вытокі якіх пачынаюцца каля падэшвы гары (Пціч, Іслач, Сула, Уса), узвышаецца на 40—50 м. Складзена з марэны *сожскага зледзянення*, укрыта лёсападобнымі пародамі (суглінкамі і супескамі), сфарміраванымі ў час *позерскага зледзянення*. Мае выгляд буйнога спадзіставыпуклага падняцця. Схілы на ПдЗ стромкасцю да 5°, на Пн і У — да 2°, разараныя, толькі 15% тэрыторыі на ПнЗ пад маладым лесам. На разараных участках плоскасны змыў.

ДЗЯРЖЫ́НСКІ Іван Іванавіч (9.4.1909, г. Тамбоў, Расія — 18.1.1978), расійскі кампазітар. Унук ураджэнца Беларусі Лявонція Дзяржынскага, удзельніка паўстання 1863—64, сасланага ў Тамбоў. У 1932—34 вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі ў Б.Асаф'ева і інш. Аўтар опер «Ціхі Дон» (1934, паст. ў Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі 1938 і 1951), «Узнятая цаліна» (1937), «Князь-возера» (1947), «Далёка ад Масквы» (1954), «Лёс чалавека» (1959), «Рыгор Мелехаў» (1967), муз. камедый, 3 канцэртаў для фп. з аркестрам, 2 сімф. паэм, песень, рамансаў, музыкі да драм. спектакляў і кінафільмаў. Дзярж. прэмія СССР 1950.

Літ.: Иван Дзержинский: Статьи. Воспоминания. М., 1988.

ДЗЯРЖЫ́НСКІ (сапр. Чаржынскі) Уладзіслаў Вікенцьевіч (1897, в. Старакаменная Беластоцкага ваяв., Польшча — 2.4.1974), бел. крытык і літ.-знавец. Скончыў БДУ (1925). Выкладаў у Камуніст. ун-це Беларусі (1925—30). У 1930 рэпрэсіраваны, высланы ў Казань. Рэабілітаваны ў 1988. Працаваў у Татарскім ін-це павышэння кваліфікацыі настаўнікаў (1931—36), Казанскім мед. ін-це (1933—47, 1950—71). Друкаваўся з 1922. Даследаваў тагачасны літ. працэс, творчасць М.Багдановіча, Я.Купалы, Я.Коласа, З.Бядулі, М.Чарота, Ц.Гартнага і інш. Працы Дз. вылучаліся глыбінёй эстэт. аналізу, жывасцю даследчыцкай думкі.

Тв.: Максім Багдановіч як стылізатар беларускага верша // Адраджэнне. 1922. № 1; Беларуская літаратурная сучаснасць (1920—1925) // Полымя. 1925. № 1, 2, 5; Да партрэту Я.Коласа ў літаратурнай крытыцы // Якуб Колас у літаратурнай крытыцы. Мн., 1926; З.Жылуновіч як крытык // Цішка Гартны ў літаратурнай крытыцы. Мн., 1928; Янка Купала ў крытыцы нашаніўскіх сучаснікаў // Янка Купала ў літаратурнай крытыцы. Мн., 1928; Да пытання аб псіхалагічным стылі нашаніўскай паэзіі. Мн., 1928.

ДЗЯРЖЫ́НСКІ Фелікс Эдмундавіч (11.9.1877, б. маёнтак Дзяржынава Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. — 20.7.1926), савецкі парт. і дзярж. дзеяч, удзельнік польскага і рас. рэв. руху. Гімназістам у Вільні ў 1894 уступіў у с.-д. гурток, з 1895 чл. арг-цыі «Літоўская сацыял-дэмакратыя», з 1896 прафес. рэвалюцыянер. Адзін з кіраўнікоў рэвалюцыі 1905—07 у Варшаве. З 1907 чл. ЦК РСДРП. У 1910—12 працаваў у парт. арг-цыях Варшавы, Чанстаховы і інш. 6 разоў быў арыштаваны і засуджаны. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 у Маскоўскай арг-цыі бальшавікоў. Удзельнік падрыхтоўкі і правядзення Кастр. ўзбр. паўстання ў Петраградзе. З 1917 старшыня ВЧК па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам. У 1919—23 нарком унутр. спраў РСФСР. Адзін з арганізатараў «чырвонага тэрору» і ініцыятараў стварэння т.зв. папраўча-прац. лагераў. З 1919 на Усх. фронце. У жн.— вер. 1920 у Мінску, чл. РВС Зах. фронту. З 1921 нарком шляхоў зносін. З 1924 старшыня ВСНГ, адначасова старшыня *Аб'яднанага дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення* пры СНК СССР. Чл. ЦК з 1918, канд. у чл. Аргбюро з 1920, канд. у чл. Палітбюро ЦК ВКП(б) з 1924. У г.п. Івянец Валожынскага р-на адкрыты музей Дз., на б. хутары Дзяржынава — яго філіял.

ДЗЯРЖЫ́НСКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1985 на базе гіст. музея сярэдняй школы № 3 г. Дзяржынск, адкрыты ў 1987. Пл. экспазіцыі 400 м^2, 4 тыс. адзінак асн. фонду (1997). Сярод экспанатаў прылады працы эпохі неаліту, бронзавага і жал. вякоў, ляпны і ганчарны гліняны посуд, бронзавыя і жал. ўпрыгожанні з археал. помнікаў Дзяржыншчыны, манетны скарб 17 ст., абраз-складзень 19 ст., кантракт 1897 графа Г.Чапскага на перадачу зямлі ў арэнду. Экспануюцца дакументы часоў 1-й сусв. і Вял. Айч. войнаў, асабістыя рэчы і рукапісы землякоў-пісьменнікаў К.Каганца, А. Вольскага, С.Шушкевіча і інш., карціны мастакоў Дзяржыншчыны, бел. нар. адзенне і абутак, прылады працы і побыту сялян 19—20 ст., вырабы дзіцячай творчасці, прамысл. прадпрыемстваў раёна. *Г.В.Вашкевіч.*

ДЗЯРЖЫ́НСКІ РАЁН, у цэнтральнай частцы Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Пл. 1,35 тыс. км^2. Нас. 35,7 тыс. чал. (1996), гарадскога 33%. Сярэдняя шчыльн. 26 чал. на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. *Дзяржынск*, гар. пасёлкі *Негарэлае* і *Фаніпаль*, 273 сельскія населеныя пункты. Падзяляецца на 11 сельсаветаў: Бараўскі, Валмянскі, Дабрынёўскі, Дзямідавіцкі, Дзяржынскі, Ляхавіц-

кі, Путчынскі, Рубілкаўскі, Станькаўскі, Старынкаўскі, Фаніпальскі.

Раён размешчаны ў межах *Мінскага ўзвышша* і *Стаўбцоўскай раўніны*. Паверхня ўзгорыстая і пласкахвалістая. Пераважаюць выш. 180—220 м, найвыш. пункт 345 м (*Дзяржынская гара* — самы высокі пункт Беларусі). Карысныя выкапні: торф, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, гліны для грубай керамікі. Сярэдняя т-ра студз. -6,7 °С, ліп. 17,6 °С. Ападкаў 625 мм за год. Вегетацыйны перыяд 188 сут. Рака Уса з прытокамі Пратуць, Вязенская, Рапуса; на У — р. Жэсць з Алёхаўкай. Дзягільнянскае вадасх. Пашыраны дзярнова-падзолістыя і дзярнова-падзолістыя забалочаныя глебы. Пад лясамі 31% раёна, пераважаюць хваёвыя, бярозавыя і яловыя лясы.

Пад с.-г. ўгоддзямі 70,9 тыс. га, з іх асушана 14,7 тыс. га. На 1.1.1996 у раёне 16 калгасаў, 5 саўгасаў. 3 птушкафабрыкі. Жывёлагадоўчае плем. аб'яднанне «Шыкатовічы». Асн. галіны сельскай гаспадаркі — мяса-малочная жывёлагадоўля і льнаводства. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу, агародніну. Прадпрыемствы металаапр., буд. матэрыялаў (жалезабетонныя і маставыя канструкцыі), лёгкай (швейнай, тэкст.) і харч. прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтамагістраль Мінск—Брэст, аўтадарогі ад Дзяржынска на Барысаў, Івянец, Заслаўе, Станькава—Дабрынёва і Негарэлае—Узда. У раёне 23 сярэднія, 3 базавыя і 11 пач. школ, 32 клубы, 37 б-к, 7 бальніц, абл. туберкулёзная бальніца, 16 фельч.-ак. пунктаў. Помнікі архітэктуры: капліца-пахавальня (пач. 20 ст.) у в. Баравое, Успенскі касцёл (2-я пал. 18 ст.) у в. Волма; сядзібы (19 ст.) у вёсках Волма і Вял. Навасёлкі; капліца (1-я пал. 19 ст.) у в. Дабрынёва; сядзібна-паркавы ансамбль (2-я пал. 19 ст.) у в. Станькава, касцёл (1836) у в. Старынка. Выдаецца газ. «Сцяг Кастрычніка». *С.І.Сідор.*

ДЗЯРКА́Ч, птушка, гл. *Драч*.



ДЗЯРКА́Ч Анатоль (сапр. Зіміёнка Анатоль Рыгоравіч; 18.4.1887, в. Турэц Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. — 5.9.1937), бел. паэт. Скончыў Навагрудскае гар. вучылішча (1904). Служыў пісарам у Мінскай гар. і земскай управах. За рэв. дзейнасць быў зняволены ў турму, адбываў ссылку. Працаваў у газ. «Беларуская вёска», «Піянер Беларусі» і інш. 16.10.1936 рэпрэсіраваны. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся

А.Дзяркач.

з 1904. З пач. 1920-х г., выкарыстоўваючы прыёмы дасціпнага апавядання, агітацыйнай прыпеўкі, фельетона, нар. жарта, высмейваў у вершах грамадскую і быт. адсталасць, рэліг. забабоны, выкрываў царк. служкаў. У вершах для дзяцей цёплы гумар, канкрэтнасць паэт. назіранняў; асн. іх тэмы — сяброўства, працавітасць, з'явы прыроды («Нашы прыяцелі», «Працавітая дзяўчынка», «Першы дзень у дзіцячым садзе», усе 1928; «Звяры нашых лясоў», 1929). На бел. мову пераклаў паасобныя творы У.Маякоўскага, А.Барто, С.Маршака, К.Чукоўскага і інш.

Тв.: Пра папоў, пра дзякоў, пра сялян-мужыкоў. Мн., 1925; Міколава гаспадарка. Мн., 1927; Усім патроху... Мн., 1930; Бог удвох. Мн., 1930; Качаргой па абразох. Мн., 1930.

А.М.Пяткевіч.

ДЗЯРНО́ВА, Дзярноўка, рака ў Талачынскім і Аршанскім р-нах Віцебскай вобл., правы прыток р. Адроў (бас. Дняпра). Даўж. 21 км. Пл. вадазбору 99 км^2. Пачынаецца за 1 км на ПдЗ ад в. Воўкавічы Талачынскага р-на. Цячэ па Аршанскім узв. Рэчышча ад вытоку да в. Вязьмічы (7 км) і каля в. Смаляны Аршанскага р-на (2,2 км) каналізавана.

ДЗЯРНО́ВА-КАРБАНА́ТНЫЯ ГЛЕ́БЫ, тып глеб, што фарміруюцца ў месцах выхаду на паверхню карбанатных парод (вапнякоў, даламітаў, мелу і інш.) пры нармальным увільгатненні пад травяністай расліннасцю. У залежнасці ад ступені выяўлення працэсаў вышчалочвання і ападзольвання Дз.-к.г. падзяляюць на 3 падтыпы: тыповыя Дз.-к.г., вышчалачаныя, ападзоленыя, якія ўключаюць вял. колькасць родаў, відаў і разнавіднасцей. Пашыраны невял. ўчасткамі ў еўрап. ч. Расіі, на Д. Усходзе. На Беларусі найб. трапляюцца ў Магілёўскай, Брэсцкай і Віцебскай абласцях. Высокаўрадлівыя, маюць 5—9% гумусу, інтэнсіўна асвойваюцца пад ворыва. Прыдатныя для вырошчвання патрабавальных да глебавых умоў с.-г. культур (цукр. буракі, пшаніца, ячмень, люцэрна і інш.). Урадлівасць Дз.-к.г. павышаюць мінер. (пераважна калійнымі, марганцавымі і борнымі) угнаеннямі. *М.І.Смяян.*

ДЗЯРНО́ВА-КАРБАНА́ТНЫЯ ЗАБАЛО́ЧАНЫЯ ГЛЕ́БЫ, тып глеб, што фарміруюцца пад лугавой расліннасцю ў месцах з неглыбокім ад паверхні заляганнем карбанатных парод у выніку ўзаемадзеяння дзярновага і балотнага глебаўтваральных працэсаў. У залежнасці ад ступені забалочанасці вылучаюць слабаглеяватыя, глеяватыя і глеевыя падтыпы. Глебы характарызуюцца вял. колькасцю гумусу і наяўнасцю дробнакамякаватай структуры, аднак у іх мала фосфару і калію. На Беларусі найб. пашыраны ў Брэсцкай і Віцебскай абл., дзе трапляюцца ў комплексе з дзярнова-глеевымі. Выкарыстоўваюцца пераважна пад лугавыя ўгоддзі. Пры выкарыстанні пад ворыва патрабуюць асушальнай меліярацыі, якая павышае іх урадлівасць у 2 разы. *М.І.Смяян.*

ДЗЯРНО́ВА-ПАДЗО́ЛІСТЫЯ ГЛЕ́БЫ, тып глеб, якія фарміруюцца пад хвойна-шыракалістымі і хвойна-драбналістымі лясамі ва ўмовах прамыўнога воднага рэжыму. Належаць да *аўтаморфных глеб*. Пашыраны на Пд лясной зоны Усх.-Еўрап. і Зах.-Сібірскай раўнін. На тэр. Беларусі найб. пашыраны тып глеб, размешчаны вял. масівамі ва ўсіх яе частках, пераважна на павышаных элементах рэльефу (у паніжаных пераважаюць *дзярнова-падзолістыя забалочаныя глебы*). Асн. плошча ворных зямель размешчана на супесках і пясках. Значная частка Дз.-п.г. мае мала гумусу (да 2%) і пажыўных рэчываў, дрэнную аэрацыю і нетрывалую структуру, невысокую насычанасць асновамі. Іх урадлівасць павышаюць паглыбленнем ворнага гарызонта і паляпшэннем яго структуры, вапнаваннем глебы, унясеннем мінер., арган. і зялёных угнаенняў, мікраэлементаў, увядзеннем правільных севазваротаў. *М.І.Смяян*

ДЗЯРНО́ВА-ПАДЗО́ЛІСТЫЯ ЗАБАЛО́ЧАНЫЯ ГЛЕ́БЫ, балотна-падзолістыя глебы, перыядычна залішне ўвільготненыя глебы, якія ўтварыліся пад лісцева-хвойнымі і хвойна-шыракалістымі лясамі з травяным наземным покрывам. Пашыраны на раўнінных паніжэннях з запаволеным сцёкам паверхневых (атмасферных) вод ці блізкім заляганнем грунтавых вод. Паводле грануламетрычнага складу падзяляюцца на суглінкавыя, супясчаныя і пясчаныя, па ступені залішняга ўвільгатнення — на глеевыя, глеяватыя і слабаглеяватыя. Лішак вільгаці трымаецца 60—200 дзён у годзе, улетку магчымы яе недахоп. Такія глебы маюць часцей высокую кіслотнасць і бедныя элементамі жыўлення раслін, патрабуюць вапнавання. Колькасць гумусу павялічваецца ў залежнасці ад ступені ўвільгатнення: пад прыроднай расліннасцю 10—25%, на ворнай зямлі 2—

3,5%. Іх асваенне і акультурванне патрабуе асушальнай меліярацыі, унясення арган. і мінер. угнаенняў, паляпшэння водна-фіз. уласцівасцей. *Т.А.Раманава.*

ДЗЯРНО́ВЫЯ ЗАБАЛО́ЧАНЫЯ ГЛЕ́БЫ, залішне ўвільготненыя глебы, якія ўтварыліся пад травяным покрывам. Паўгідраморфныя глебы. На пясчаных і супясчаных пародах фарміруюцца пад уплывам грунтавога ўвільгатнення, на гліністых, сугліністых і двухчленных — пад уплывам паверхневых (схілавых) вод. У залежнасці ад працягласці залішняга ўвільгатнення падзяляюцца на слабаглееватыя (часова залішне ўвільготненыя), глееватыя і глеевыя. На Беларусі трапляюцца ў паніжэннях невял. масівамі і ў месцах з блізкім ад паверхні заляганнем грунтавых вод (на Бел. Палессі). Займаюць каля 11% сельгасугоддзяў, пераважна выкарыстоўваюцца пад сенажаці. Лішак вільгаці ў гэтых глебах трымаецца 90—200 дзён у годзе, на працягу 10—90 дзён можа адзначацца яе недахоп. Перагнойны гарызонт глеб не перавышае 20—30 см, пад ім знаходзіцца аглеены гарызонт блакітнага колеру (у дзярнова-глеевых глебах) або такі ж з рудымі плямамі (у дзярнова-глееватых), які паступова пераходзіць у глебаўтваральную (мацярынскую) пароду. Сугліністыя і звязна-супясчаныя Дз.з.г. пасля гідратэхн. меліярацыі выкарыстоўваюцца пад пасевы. *Т.А.Раманава.*

ДЗЯРУ́ГА Аляксандр Анісімавіч (23.8.1901, Мінск — 9.5.1979), бел. дзеяч самадз. мастацтва. Засл. дз. культ. Беларусі (1961). Скончыў бел. настаўніцкія курсы ў Вільні (1922). Арганізатар і кіраўнік (1948—79) Смаргонскага нар. цымбальнага аркестра, які пад яго кіраўніцтвам дасягнуў значнага выканальніцкага майстэрства. Аўтар шэрагу апрацовак для цымбальнага аркестра, у т.л. нар. песень бел. «Лянок» і польск. «Трамблянка», арыг. твораў. Зрабіў шмат запісаў бел. песеннага і інстр. фальклору («У Марцінавым саду», «Залескія прыпеўкі», «Смаргонская полька» і інш.). *Г.І.Цітовіч.*

ДЗЯРЭ́ГА (Odontites), род кветкавых раслін сям. залозніковых. Каля 20 відаў. Пашыраны ў Еўропе, пазатрапічнай Азіі. Паўн. Афрыцы. На Беларусі 2 віды: усюды — Дз. звычайная, або позняя (O. vulgaris), рэдка — веснавая (O. verna). Растуць на лугах, папарах, як пустазелле, каля дарог.

Аднагадовыя паўпаразітныя травяністыя расліны з прамастойнымі простымі або разгалінаванымі сцёбламі, са слаба развітымі каранямі і *гаўсторыямі* на іх. Лісце супраціўнае, ланцэтнае або ланцэтна-яйцападобнае, суцэльнае, па краі каротказубчастае, рэдка (верхняе) супольнакрайняе. Кветкі дробныя, двухполыя, двухгубыя, ружовыя або чырванаватыя, размешчаны ў пазухах прыкветных лістоў і сабраны ў верхавінкавыя гронка- або коласападобныя суквецці. Плод — каробачка. Лек. і меданосныя расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДЗЯРЭ́ЗКА, лікападыела (Lycopodiella), род споравых раслін сям. дзеразовых. Каля 20 відаў. Пашыраны амаль па ўсім зямным шары. На Беларусі зрэдку трапляецца Дз. заліўная (L. inundata). Расце на сфагнавых балотах, вільготных грунтавых агаленнях у кар'ерах і каля дарог. Занесена ў Чырв. кнігу Рэспублікі Беларусь.

Шматгадовазялёныя расліны з доўгімі вілавата-галінастымі (дыхатамічнымі) паўзучымі сцёбламі даўж. да 1 м, якія месцамі перарываюцца. Ад сцёблаў адыходзяць вертыкальныя густаблісцелыя парасткі выш. да 10 см,

Дзярэга звычайная.

Дзярэзка заліўная.

на канцах якіх утвараюцца стробілы. Лісце дробнае, сядзячае, лінейна-ланцэтнае. Спарафілы зялёныя, шылападобныя, каля асновы расшыраныя, па краі зубчастыя. Лек., фарбавальныя і дэкар. расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДЗЯРЭ́ЧЫН, вёска ў Зэльвенскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Сіпа, на аўтадарозе Гродна—Слонім. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 15 км на ПнУ ад Зэльвы, 98 км ад Гродна, 16 км ад чыг. ст. Зэльва. 795 ж., 347 двароў (1997).

У пач. 15 ст. сяло баярына Дрэмута. З 15 ст. належаў Копачам, Сангушкам, Вішнявецкім, Нарбутам, Палубенскім, Сапегам і інш. З 1537 мястэчка. У 1786 пабудаваны *Дзярэчынскі палац*. У 1790 было 160 двароў. З 1795 у Рас. імперыі, у Слонімскім пав. У 1878 — 2269 ж., 2 школы, 2 царквы, сінагога, 28 крам. У 1921—39 у Польшчы. З 1939 у БССР, цэнтр сельсавета Зэльвенскага р-на. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі ў чэрв. 1942 расстралялі ў Дз. больш за 2 тыс. чал. З 14.4.1962 у Мастоўскім, з 25.12.1962 у Ваўкавыскім, з 1965 у Мастоўскім, з 1966 у Зэльвенскім р-нах. У 1971 — 991 ж., 334 двары.

Лесазавод. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры — *Дзярэчынская Спаса-Праабражэнская царква* (сярэдзіна 19 ст.), касцёл Ушэсця (пач. 20 ст.).

ДЗЯРЭ́ЧЫНА, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл., на р. Морач, каля аўтадарогі Слуцк—Іванцэвічы. Цэнтр Блеўчыцкага с/с. За 21 км на Пд ад Капыля, 136 км ад Мінска, 13 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 170 ж., 87 двароў (1997). Клуб.

ДЗЯРЭ́ЧЫНСКАЯ СПА́СА-ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Пабудавана ў сярэдзіне 19 ст. ў в. Дзярэчын Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. Кампазіцыя будынка складаецца з асн. квадратнага ў плане аб'ёму, прамавугольнай (звонку, унутры паўкруглай) апсіды і бабінца.



Дзярэчынская Спаса-Праабражэнская царква.

Асн. аб'ём накрыты 4-схільным дахам з купалам на драўляным светлавым 8-гранным барабане ў цэнтры і 4 галоўкамі па вуглах. У інтэр'еры 4 слупы падтрымліваюць канструкцыю сферычнага купала на ветразях. Хоры над уваходам адкрываюцца ў зальнае памяшканне арачным праёмам. Алтарная і падкупальная часткі ўпрыгожаны фрэскавай размалёўкай. *А.Ю.Пятросава.*

ДЗЯРЭ́ЧЫНСКІ ПАЛА́Ц. Пабудаваны ў 1786 у в. Дзярэчын Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. ў стылі класіцызму (арх. Я.С.Бекер і Л.С.Гуцэвіч) як ваенная навуч. ўстанова («Акадэмія»). Фундатар — канцлер ВКЛ А.Сапега. У пач. 19 ст. яго сын Францішак перарабіў будынак у палац і абкружыў яго паркам. У пач. 20 ст. перароблены ў вайск. казармы (да 1906).

Палац — аднапавярховы прамавугольны ў плане мураваны будынак. Цэнтр. ч. з мансардай на гал. фасадзе была вылучана 8-калонным дарычным порцікам. Сярод памяшканняў вызначаліся карцінная галерэя, археал. кабінет і 6-ка. Палац размяшчаўся ў парку рэгулярна-тэраснага тыпу («Малы Версаль») з сістэмай ставоў. Палацава-паркавы комплекс знішчаны ў 1920—30-я г. *А.М.Кулагін.*

Дзярэчынскі палац.

ДЗЯСНА́, рака, левы прыток р. Дняпро, у Расіі і на Украіне. Даўж. 1130 км. Пл. бас. 88,9 тыс. км^2. Бярэ пачатак на Смаленска-Маскоўскім узв., упадае ў Дняпро вышэй Кіева. У верхнім цячэнні берагі пераважна нізінныя і забалочаныя, ніжэй г. Бранск правы бераг павышаецца. Пасля ўпадзення р. Сейм даліна расшыраецца, рака ўтварае шмат рукавоў і старыц. Рэчышча пясчанае, звілістае, няўстойлівае, шмат мелей. Гал. прытокі: Судасць, Сноў (справа), Болва, Наўля, Няруса, Сейм і Асцёр (злева). Ледастаў са снеж. да красавіка. Вясной у паводку шырока разліваецца. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 360 м^3/с. Рэгулярнае суднаходства ад г. Ноўгарад-Северскі. Гал. прыстані: Ноўгарад-Северскі, Макошына, Чарнігаў, Асцёр, Жукін.

ДЗЯСНІ́НСКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура неалітычных плямён, якія ў 2-й пал. 4-га — 3-м тыс. да н.э. жылі ў бас. Дзясны і на У Пасожжа. Асн. заняткі насельніцтва — паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва. Паселішчы пл. 300—600 м^2 размяшчаліся на прыбярэжных тэрасах, узгорках, якія ўдаваліся ў даліны рэк. Жытлы наземныя або заглыбленыя ў зямлю, прамавугольнай або авальнай формы, пл. 10—12 м^2. Агнішчы адкрытага тыпу былі ў цэнтры жытлаў. Плямёны Дз.к. выраблялі крамянёвыя, грубаапрацаваныя сякеры, скрэблы, бакавыя і клінападобныя разцы, канцавыя скрабкі, вастрыі і інш., грубы гліняны вастрадонны посуд аздоблены круглымі, авальнымі і ромбападобнымі ямкамі, з якіх скампанаваны паясы, рамбічныя і шахматныя кампазіцыі. На позднім этапе Дз.к. з'явіліся адбіткі перавітай шнурам палачкі (т.зв. лапчасты арнамент), наколы пад вуглом, што было вынікам уплыву суседніх плямён *днепра-данецкай культуры* і *верхнедняпроўскай культуры*. *А.Г.Калечыц.*

ДЗЯСНІ́ЦКІ Сямён Яфімавіч (каля 1740, г. Нежын, Украіна — 26.6.1789), расійскі асветнік, юрыст. Чл. Расійскай акадэміі (з 1783). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1759—60), ва ун-це ў Глазга (Вялікабрытанія). Д-р цывільнага і царк. права (1767). У 1767—87 праф. Маскоўскага ун-та, дзе першы пачаў распрацоўку рус. права і выкладанне на рус. мове. Паклаў пачатак гіст. школе права ў Расіі. Выкладанню права надаў практычны кірунак з прыцягненнем рус. заканадаўства і юрыд. практыкі («Слова аб прамым і найбліжэйшым спосабе да навучання юрысprудэнцыі», 1768). Найважнейшым звяном у развіцці грамадства лічыў устанаўленне прыватнай уласнасці і найперш зямельнай уласнасці. Адсюль вынікае антыфеад. характар яго пазіцыі, крытыка прыгоннага права, спачуванне бурж. развіццю, хоць і непаслядоўныя.

Тв.: У кн.: Избранные произведения русских мыслителей второй половины XVIII века. М., 1952. Т. 1.

ДЗЯ́ТЛАВА, горад у Гродзенскай вобл., цэнтр Дзятлаўскага р-на, на р. Дзятлаўка. За 165 км ад Гродна, 13 км ад чыг. ст. Наваельня на лініі Баранавічы—Ліда. Аўтадарогамі злучана са Слонімам, Лідай, Навагрудкам. 8,6 тыс. ж. (1997).

Упершыню згадваецца ў 1440—50-я г. пад назвай Здзяцел. У 1498 вял. кн. літ. Аляксандр падараваў воласць Здзяцел літ. гетману кн. К.І.Астрожскаму. У канцы 15 — 1-й пал. 16 ст. ў Троекскім ваяв., у 1566 мястэчка Слонімскага пав. З пач. 17 ст. належала Сапегам, Палубенскім, Радзівілам, Солтанам, з 1831 дзярж. ўласнасць. З 1795 у Рас. імперыі, мястэчка Слонімскага пав. У 1897 — 3155 ж., 479 будынкаў, 2 школы, царква, касцёл, 4 яўр. малітоўныя дамы, шпіталь, 2 дрэваапр. ф-кі, 2 медаварні, больш за 40 майстэрняў. У 1921—39 у Польшчы. З 1939 у БССР, з 1940 гар. пасёлак, да 1945 і з 1965 цэнтр *Дзятлаўскага раёна*. З 30.6.1941 да 9.7.1944 акупіравана ням.-фашыстамі, якія загубілі ў Дз. і раёне 4716 чал., дзейнічала *Дзятлаўскае камсамольска-маладзёжнае падполле*. У 1962—65 Дз. ў Слонімскім р-не. У 1971 — 4,5 тыс. ж. З 1990 горад.

Прадпрыемствы харч., дрэваапр. прам-сці. Дзейнічае *Дзятлаўскі музей народнай славы*. Помнікі архітэктуры — *Дзятлаўскі касцёл Успення Багародзіцы* (1624—46), *Дзятлаўская сядзіба* (1751), капліца (1813). Брацкія могілкі сав. воінаў і партызан, магілы ахвяр фашызму. *В.У.Шаблюк.*

ДЗЯ́ТЛАВА Аляксандра Яўгенаўна (н. 25.6.1954, Алматы), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976), з 1979 выкладае ў Бел. акадэміі мастацтваў. Выканала дэкар. рэльефы «Поры года» (1980), «Мінск» (1981), гарэльеф «Дабравешчанне» (1984) для Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, дэкар. пластыку і святільні «Матылькі ўначы» (1995) для каледжа ў г. Ніжнявартаўск (Расія), для Наваполацкага Дома сямейных урачыстасцей (1997) і інш. Аўтар дэкар. пластыкі — трыпціх «Світанак», «Поўдзень», «Змярканне» (1978); «Капрычыо» (1981), «Рэха» (1983), «Гербарый» (1990), «Дутыя аўтарытэты» (1996), серый «Поўня» (1988—96), «Фармацыя» (1991), серый дэкар. ваз «Птушкі», «Архідэі» і інш. Творчасці ўласцівы сімвалізм, асацыяцыі; макс. выразнасць дасягаецца за кошт выкарыстання прыроднай фактуры і якасцей пластычных матэрыялаў.

А.Дзятлава. Дутыя аўтарытэты. 1996.

ДЗЯ́ТЛАВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1926—27. Утвораны 8.12.1926 у складзе Гомельскай акругі. Цэнтр — Старыя Дзятлавічы. Пл. 1049 км^2, нас. 25 413 чал. (1926). Падзяляўся на 25 сельсаветаў. 4.8.1927 скасаваны. Тэр. перададзена ў Рэчыцкі, Лоеўскі і Гомельскі р-ны.

ДЗЯ́ТЛАВІЧЫ, вёска ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., на правым беразе р. Цна; чыг. ст. на лініі Лунінец—Баранавічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на Пд ад Лунінца, 250 км ад Брэста. 2556 ж., 816 двароў (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Магілы ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — Праабражэнская царква (1823).

ДЗЯ́ТЛАВЫЯ (Picidae), сямейства птушак атр. дзятлападобных. 38 родаў, 213 відаў. Пашыраны ў трапічнай і ўмеранай зонах, акрамя палярных абласцей. Мадагаскара, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Новай Гвінеі і Палінезіі. Найб. разнастайныя ў Паўд. Амерыцы. Жы-

вуць пераважна ў дрэвавых і кустовых насаджэннях. 4 віды і 8 падвідаў у Чырв. кнізе МСАП. На Беларусі 10 відаў: *жаўна, круцігалоўка, зялёны дзяцел, трохпальцы дзяцел*, вялікі, сярэдні і малы стракатыя, сівы, беласпінны, сірыйскі; у Чырв. кнізе зялёны і трохпальцы.

Даўж. 8—56 см. Большасць Дз. прыстасавана да жыцця на дрэвах. Ногі кароткія, з доўгімі пальцамі і вострымі кіпцюрамі. Долатападобная дзюба, трывалы чэрап, моцныя мышцы шыі, жорсткае рулявое пер'е хваста, якое служыць апорай пры лажанні па дрэвах, дазваляюць дзяўбці драўніну ў пошуках корму і выдзёўбваць дуплы для гнёздаў. Язык чэрвепадобны, тонкі, далёка высоўваецца для захопу корму. Некаторыя Дз. маюць слабую дзюбу і мяккі хвост (круцігалоўкі, дзяцелкі). Кормяцца насякомымі і іх лічынкамі, мурашкамі, насеннем, пладамі, сокам дрэў. Гняздуюцца ў дуплах дрэў і вял. кактусаў, жыхары пустынь — у норах або сярод камянёў. Нясуць 2—12 яец.

ДЗЯ́ТЛАЎ Алесь (Аляксандр Мікалаевіч; н. 3.6.1936, в. Туркі Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1959). Працаваў у друку, на кінастудыі «Беларусьфільм». З 1980 у час. «Родная прырода». Друкуецца з 1956. Першая кн. апавяданняў «Росы на паплаве» (1974). У аповесцях «Белы месяц сакавік» (1977), «Сляды», «Начное неба ў ліпені» (абедзве 1981), «У вераснёвы вечар» (1987) даследуе духоўны свет чалавека, пытанні маралі і этыкі, праблемы адказнасці асобы перад сабой і грамадствам. Пра вясковых настаўнікаў аповесць «Брод» (1981), апавяданні «Поезд ішоў праз ноч», «Юрачка». Тэму пераемнасці пакаленняў, трагедыю Айч. вайны асэнсоўвае ў аповесці «Час даспелага жыта» (1981), апавяданнях «Вяртанне», «Жоўтае ліста», «Дана» і інш. Сутнасць змен у жыцці, горкія ўрокі мінулага спрабуе спасцігнуць у рамане «Парог» (1993), апавяданнях «Трое на прахадной», «Белыя людзі» і інш. Аўтар нарысаў, фельетонаў, твораў для дзяцей («Стрэл на белым лузе», 1985). Уздымае экалагічныя праблемы.

Тв.: Белы месяц сакавік. Мн., 1977; Сляды. Мн., 1981; Вяртанне. Мн., 1987; Парог. Мн., 1993.

І.У.Саламевіч.

ДЗЯ́ТЛАЎ Яўтен Канстанцінавіч (н. 17.5.1923, в. Бабы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1988). Скончыў Маскоўскі арх. ін-т (1950). З 1950 працаваў у г. Алматы (з 1961 гал. архітэктар горада); з 1965 — у Мінску. Быў кіраўніком майстэрні генплана ін-та «Мінскпраект», гал. архітэктарам горада (1970—74), гал. архітэктарам ін-таў «Белдзіпрагандаль» (1974—80), «Мінскпраект» (1980—85). Асн. працы: у Алматы — гасцініца «Казахстан» (1954—61), тэлецэнтр (1956—59), кінатэатр «Алатау» (1958—60); у Мінску — праект дэталёвай планіроўкі жылых раёнаў Усход і Серабранка (1965—68, у сааўт.) і цэнтра горада (1969—73, у сааўт.), універсам «Рыга» і рэстаран «Свіцязь» (1978—80).

1

2

3

4

5

Да арт. **Дзятлавыя**. Дзятлы: 1 — вялікі стракаты; 2 — сярэдні стракаты; 3 — малы стракаты; 4 — беласпінны; 5 — сірыйскі.

ДЗЯ́ТЛАЎКА, Дзяцелка, Зіталла, Памарайка, рака ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., левы прыток р. Моўчадзь (бас. Нёмана). Даўж. 26 км. Пл. вадазбору 151 км^2. Пачынаецца каля в. Юравічы, у межах Навагрудскага ўзв., цячэ праз г. Дзятлава. На ўсім працягу каналізаваная. Каля в. Нагародавічы створана сажалка.

ДЗЯ́ТЛАЎСКАЕ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ. Дзейнічала з вер. 1941 да ліп. 1944 у Дзятлаўскім і Казлоўшчынскім р-нах Гродзен-

скай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Аб'ядноўвала больш за 30 чал., 2 групы: у в. Явар (20 чал., кіраўнікі С.І.Белы, Б.І.Белы), в. Зачэпічы (М.П.Сніціч, Н.П.Сніціч). Падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, збіралі і перадавалі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, прадукты; вясной 1942 пашкодзілі тэлеф. сувязь паміж вёскамі Нясілавічы і Гезгалы; здабылі звесткі пра размяшчэнне варожага гарнізона ў г.п. Казлоўшчына, з іх дапамогай партызаны восенню 1942 разгромілі гарнізон; з групай партызан праводзілі дыверсіі на чыгунцы, падпалілі склады на ст. Наваельня. У канцы 1943 большасць падпольшчыкаў пайшла да партызан. *М.Ф.Шумейка.*

ДЗЯ́ТЛАЎСКАЯ СЯДЗІ́БА, помнік архітэктуры ракако. Створана ў 1751 па

Дзятлаўская сядзіба. З малюнка Н.Орды. 19 ст.

фундацыі Мікалая Радзівіла ў г.п. Дзятлава Гродзенскай вобл. на беразе р. Дзятлаўка. Комплекс уключае палац, пейзажны парк з вадаёмам і творамі архітэктуры малых формаў (масткі, павільёны), які з У паўкальцом агінае палац. Гасп. пабудовы размяшчаліся пры ўездзе з Пд у сядзібу.

Палац — мураваны 2-павярховы прамавугольны ў плане аб'ём з высокім вальмавым дахам і 2 вуглавымі вежападобнымі алькежамі на цокальным паверсе, накрытымі ўвагнутымі шатрамі з заломамі (алькежы не зберагліся). *А.М.Кулагін.*

ДЗЯ́ТЛАЎСКІ КАСЦЁЛ УСПЕ́ННЯ БАГАРО́ДЗІЦЫ, помнік архітэктуры стылю барока. Пабудаваны ў 1624—46 у г.п. Дзятлава Гродзенскай вобл. Гал. фасад і інтэр'ер пасля пажару ў 1743 перабудаваны (да 1751; арх. А.Асікевіч).

Мураваны 1-нефавы 2-вежавы храм накрыты агульным 2-схільным (над апсідай конусападобным) дахам. Сцены рытмічна расчлянёны вертыкальнымі контрфорсамі. Гал. фасад падзелены развітымі гарызантальнымі цягамі на 3 часткі. Фасады ўпрыгожаны плоскімі пілястрамі, раскрапоўкамі, хвалістымі карнізамі, глыбокімі нішамі. У інтэр'еры зберагліся 7 алтароў 18 ст. ў стылі ракако. *Т.В.Габрусь.*

ДЗЯ́ТЛАЎСКІ МУЗЕ́Й НАРО́ДНАЙ СЛА́ВЫ. Адкрыты ў 1968 у г.п. Дзятлава Гродзенскай вобл. Пл. экспазіцыі 326 м^2, больш за 10 тыс. экспанатаў (1997). Экспазіцыя музея знаёміць з гісторыяй Дзятлаўшчыны са стараж. часоў да нашых дзён. Сярод экспанатаў археал. знаходкі эпох мезаліту і неаліту, човен 16 ст., выяўлены каля в. Пархуты, матэрыялы пра землякоў — удзельнікаў кастр. падзей 1917, грамадз. вайны, пра становішча працоўных у 1920—30-я г., дзейнасць КПЗБ. Экспануюцца вырабы мясц. майстроў, прадметы нар. побыту, адзенне, узоры маст. ткацтва, дакументы, асабістыя рэчы С.В.*Прытыцкага*, В.З.*Харужай*, М.*Танка*. Асобныя стэнды прысвечаны падзеям Вял. Айч. вайны (дзейнасць падполля, партызан, злачынствы ням.-фаш. акупантаў, вызваленне раёна), Героям Сав. Саюза Б.А.*Булату*, Ф.М.*Сінічкіну*. Макет помніка скульпт. А.Салятыцкага і карціна мастака П.Свентахоўскага прысвечаны І.Ю.*Філідовічу*, які паўтарыў подзвіг І.Сусаніна. *Т.В.Палхоўіч.*

Дзятлаўскі касцёл Успення Багародзіцы.

ДЗЯ́ТЛАЎСКІ РАЁН, на ПдУ Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Пл. 1,5 тыс. км^2. Нас. 41,6 тыс. чал. (1996), гарадскога — 36%. Сярэдняя шчыльн. 27 чал. на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. *Дзятлава*; гар. пасёлкі *Казлоўшчына* і *Навагрудак*, 226 сельскіх населеных пунктаў. Падзяляецца на 14 сельсаветаў: Вензавецкі, Войневіцкі, Гербелевіцкі, Данілавіцкі, Дварэцкі, Дзем'янавецкі, Дзянісаўскі, Дзятлаўскі, Жукоўшчынскі, Мяляхавіцкі, Парэцкі, Раготнаўскі, Рудаяварскі, Таркачоўскі.

Паверхня раёна ўзгоркава-раўнінная. На Пн і З *Нёманская нізіна*, на У адгор'і *Навагрудскага ўзвышша*. Пераважаюць выш. 140—200 м, найвыш. пункт 283 м (на ПдУ ад Дзятлава). Карысныя выкапні: торф, мел, пясчана-жвіровы матэрыял, гліны (у т.л. цэментныя і аглапарытавыя), буд. пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -6,1 °С, ліп. 17,6 °С. Ападкаў 620 мм за год. Вегетац. перыяд 193 сут. Рака Нёман з прытокамі Моўчадзь (на ёй Гезгальскае вадасх.) з Дзятлаўкай і Шчара з Пад'яваркай. Пашыраны дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя, дзярновыя і дзярнова-карбанатныя глебы. Пад лясамі 42% тэр. раёна, лясы пераважна хваёвыя.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 70,3 тыс. га, з іх асушана 15,5 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 14 калгасаў і 3 с.-г. калектыўныя прадпрыемствы. Асн. галіны сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля, бульбаводства. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры. Пасевы лёну. Прадпрыемствы харч. (вытв-сць віна-лікёра-гарэлачных вырабаў, цукерак-карамеляў, макароны, крухмалу і інш.), лёгкай (ільновалакно), дрэваапр. (мэбля, піламатэрыялы), буд. матэрыялаў прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць чыг. Ліда—Баранавічы, аўтадарогі Ліда—Дзятлава—Слонім, Дзятлава—Наваельня—Навагрудак, Наваельня—Баранавічы. У раёне 18 сярэдніх, 8 базавых і 1 пач. школа, прафес.-тэхн. вучылішча, 22 дашкольныя ўстановы, 30 клубаў, 46 б-к, 4 бальніцы, 28 фельч.-ак. пунктаў. Санаторыі «Наваельня» (рэсп. туберкулёзны), «Радон» (міжкалгасны), дзіцячы «Ластаўка». Помнікі архітэктуры: капліца (1928) у в. Азяраны; сядзіба (пач. 20 ст.) у в. Боркі; Петрапаўлаўская царква (1875) у в. Вензавец; Троіцкая царква (1897) у в. Войневічы; Георгіеўская царква (1866) у в. Вял. Воля; Георгіеўская царква (канец 19 — пач. 20 ст.) у в. Горка; вадзяны млын (канец 19 — пач. 20 ст.), касцёл Цела Гасподняга (1904) і Пакроўская царква (пач. 20 ст.) у в. Дварэц; сядзіба (1819) у в. Жыбарты; капліца (1908) у в. Лапушна; Мікалаеўская царква (2-я пал. 19 ст.) у в. Нагародавічы; царква (1836) у в. Накрышкі; царква (19 ст.) у в. Нянадавічы; касцёл Анёла Стража (19 ст.) у в. Раготна; касцёл св. Юзафа (пач. 20 ст.) у в. Руда Яварская; царква Раства Багародзіцы (пач. 20 ст.) у в. Явар. Выдаецца газ. «Перамога».

ДЗЯ́ТЛЫ, гл. ў арт. *Дзятлавыя.*

«ДЗЯЎЧЫ́НА Ў ЗЕ́ЛЕНІ», кветкавая расліна. Гл. ў арт. *Чарнушка.*

ДЗЯ́ЦЕЛ ЧО́РНЫ, гл. *Жаўна.*

ДЗЯ́ЦЬКАЎСКІ ХРУСТАЛЁВЫ ЗАВО́Д, прадпрыемства гатунковага (сталовага) шкляного посуду і вырабаў з хрусталю ў г. Дзяцькава Бранскай вобл. (Расія). Засн. ў 1790 І.А.Мальцовым. Асн. прадукцыя: высокамаст. хрусталь з алмазнай гранню і вырабы з нацветам. Славіўся гутным посудам. На з-дзе ствараюць новыя формы посуду, удасканальваюць прыёмы іх апрацоўкі і аздаблення (глыбокае траўленне, гравіроўка, налепы і інш.).

ДЗЯЧЭ́НКА Уладзімір Аляксеевіч (н. 8.9.1942, г.п. Дзяржня Хмяльніцкай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне с.-г. машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1996). Скончыў Растоўскі-на-Доне ін-т с.-г. машынабудавання (1964). З 1972 на Зах. дзярж. машынавыпрабавальнай станцыі (пас. Прывольны Мінскага р-на). З 1975 у Ін-це надзейнасці машын АН Беларусі. Навук. працы па дынаміцы, надзейнасці і паскораных выпрабаваннях трактароў і с.-г. машын. Распрацаваў тэхн. прылады для гашэння хістанняў у элементах канструкцый с.-г. тэхнікі.

Тв.: Комплексная механизация кормопроизводства. М., 1987 (у сааўт.); Ускоренные испытания изделий машиностроения. Мн., 1997 (у сааўт.).

«ДИФФЕРЕНЦИА́ЛЬНЫЕ УРАВНЕ́НИЯ», штомесячны матэм. навук. часопіс. Засн. ў 1965 у Мінску як усесаюзны, з 1992 часопіс Расійскай АН, які выдаецца пры садзеянні Ін-та матэматыкі АН Беларусі. Асн. навук. кірункі: звычайныя *дыферэнцыяльныя ўраўненні*, ураўненні ў частковых вытворных, спектральная тэорыя дыферэнцыяльных аператараў, інтэгральныя і інтэгра-дыферэнцыяльныя ўраўненні, ураўненні ў канечных рознасцях, а таксама іх дастасаванні ў аўтам. кіраванні, інфарматыцы і матэм. мадэляванні.

ДЛУГАПО́ЛЕ-ЗДРУЙ (Długopole Zdrój), бальнеакліматычны курорт у Польшчы. На ПдУ ад г. Валбжых, у Клодзскай катлавіне Цэнтр. Судзетаў паблізу мяжы з Чэхіяй. Развіваецца з пач. 19 ст., крыніцы мінер. вод вядомы з 16 ст. Добра ахаваны ад вятроў, вылучаецца мяккім умераным кліматам. Прыродныя ўмовы спрыяльныя для лячэння органаў стрававання і кровазвароту. Паблізу ў г. Быстшыца-Клодзка шмат арх.-гіст. помнікаў (13—17 ст.), музеі філуменіі.

ДЛУ́ГАШ (Długosz) Ян (1415, в. Бжазніца Пётркаўскага ваяв., Польшча — 19.5.1480), польскі гісторык, дыпламат, царк. дзеяч. Вучыўся ў Кракаўскай акадэміі (1428—31). Канонік кракаўскі (з 1436). У 1433—55 сакратар і канцлер кардынала З.Аляснідкага. Пасля яго смерці прыблізаны караля Казіміра IV Ягелончыка, падтрымліваў яго знешнюю палітыку, з 1467 выхавацель сыноў караля. У 1480 арцыбіскуп львоўскі. Гал. праца Д. «Гісторыя Польшчы» (шакш «Летапісы, або Хронікі слаўнага Каралеўства Польскага» ў 12 кн. на лац. мове, 1455—80) ахоплівае падзеі ад легендарных часоў да 1480, створана на падставе шматлікіх польск. і замежных крыніц: хронік, летапісаў (у т.л. беларускіх), статутаў, актаў польска-крыжацкіх, каралеўскай канцылярыі (многія з іх сёння ўжо не вядомы), а таксама асабістых назіранняў. Падрабязна апісана гісторыя ВКЛ, ёсць інфармацыя пра асобныя гарады і мястэчкі Беларусі, гаспадарку і звычаі стараж. ліцвінаў і інш. Аўтар прац «Banderia Prutenorum» (1448, апісанне з гіст. каментарыем 56 крыжацкіх харугваў, здабытых пераважна пад Грунвальдам), «Insignia seu clenodia Regni Poloniae» (пасля 1472, старэйшы польскі гербоўнік) і інш.

Тв.: Rocznik czyli kroniki sławnego Królestwa Polskiego. Ks. 1—11. Warszawa, 1961—85; Рус. пер. — Грюнвальдская битва. М.; Л., 1962.

Літ.: Długossiana: Studia historyczne w pięćsetlecie śmierci Jana Długosza. Cz. 1-2. Kraków, 1980—85; Polska Jana Długosza. Warszawa, 1984; Mitkowski J. Jan Długosz. Warszawa, 1988; Plezia M. Jan Długosz // Pisarze staropolscy, sylwetki. Warszawa, 1991. T. 1. *Н.К.Мазоўка.*

ДЛУ́СКІ (Dłuski) Астап [сапр. Лангер (Langer) Адольф; 31.10.1892, г. Бучач Цярнопальскай вобл., Украіна — 12.2.1964], польскі дзярж. і паліт. дзеяч, публіцыст. Скончыў Венскі ун-т (1918). З 1911 чл. Польскай с.-д. партыі. Адзін з заснавальнікаў (1918) кампартыі Аўстрыі. З 1918 чл. кампартыі Польшчы і кампартыі Усх. Галіцыі (з 1923 кампартыі Зах. Украіны). Рэдагаваў парт. выданні. У 1929—33 у СССР, чл. ВКП(б). У 1936—45 у Францыі, у час 2-й сусв. вайны ўдзельнічаў у Руху Супраціўлення. Пасля вяртання ў Польшчу чл. ЦК Польскай рабочай партыі (з 1948 ПАРП), дырэктар Польскага ін-та па міжнар. справах (з 1960). *Н.К.Мазоўка.*

ДЛУ́СКІ Баляслаў (Баляслаў-Раман) Францавіч [19.8.1826, Віленскі (паводле інш. звестак Вількамірскі) пав. — 10.5.1905], удзельнік паўстання 1863—64 у Польшчы, Беларусі і Літве. Скончыў Маскоўскі ун-т (1861). У 1843 у час вучобы ў Віленскай гімназіі ўдзельнічаў у патрыят. руху, сасланы на Каўказ у салдаты, даслужыўся да падпаручніка. З 1852 у адстаўцы. У 1850-я г. вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Дэмакрат, прыхільнік «чырвоных», удзельнік падрыхтоўкі паўстання, з 1862 чл. Літоўскага правінцыяльнага к-та. У 1863 ваен. начальнік Ковенскага ваяв. 10.6.1863 каля мяст. Папяляны Шавельскага пав. паўстанцы на чале з Д. разбілі атрад урадавых войск. З кастр. 1863 ваен. камісар Літвы і Беларусі за мяжой. З 1873 у Галіцыі, працаваў доктарам, мастаком. Аўтар успамінаў пра паўстанне. *Г.В.Кісялёў.*

ДМАНІ́СІ, руіны горада-крэпасці (пл. 25 га) каля г.п. Дманісі ў Грузіі ў сутоках р. Машавера і Пінезауры. Узнік у эпоху сярэдневякоўя. З 9 ст. Д. валодалі арабы, пасля туркі-сельджукі, выгнаныя ў 1123 Давыдам IV Будаўніком. Росквіт Д. адносіцца да 12—13 ст. Пасля разгрому Д. Цімурам у 14 ст. пачынаецца яго заняпад. Да 18 ст. горад абязлюдзеў. У выніку раскопак (вядуцца з 1936) выяўлены гар. пабудовы, знойдзена кераміка, манеты, прылады працы, зброя, скарб з 25 залатых і сярэбраных упрыгожанняў 12—13 ст.

В.Дмахоўскі. Аўтапартрэт.

ДМАХО́ЎСКІ Вікенцій (1805 або 1807, в. Нагародавічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. — 22.2.1862), бел. жывапісец, тэатр. дэкаратар. Бацька мастака У.*Дмахоўскага*. Вучыўся ў Віленскім ун-це на літ. ф-це, адначасова займаўся жывапісам у Я.Рустэма (1826—29).

В.Дмахоўскі. Каля пераправы. 1850-я г.

Удзельнік паўстання 1830—31. У 1831—37 у эміграцыі, потым жыў у Вільні, у 1855—58 у в. Брацянка каля Навагрудка. Аўтар рамант. пейзажаў «Рака Нерыс каля Верак» (1840), «Радзіма» («Двор у Нагародавічах», 1843), «Пажар у лесе» (1850), «На начлезе» (1854), «Каля пераправы», «Замак і вежа ў Троках», «Від замка ва Ўраднікаx», «Вуліца ў Вільні», «Руіны замка ў Гальшанах», «Замак у Крэве», «Дом Міцкевіча ў Навагрудку» і інш. Сярод жывапісных работ «Аўтапартрэт», «Крыжакі пры асадзе крэпасці Пуня» (1837), «Яўрэйскае вяселле» (1860-я г.). Выканаў акварэлі — віды ваколіц Навагрудка, Вільні, «Сядзіба ў Туганавічах». У 1850—54 афармляў спектаклі ў Віленскім гар. т-ры («Галька» М.Манюшкі, «Італьянка ў Алжыры» Дж.Расіні, «Фаварытка» Г.Даніцэці і інш.).

Літ.: Дробаў Л.Н. Беларускія мастакі XIX ст. Мн., 1971; Яго ж. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974; Картинная галерея. Вильнюс, 1969.

ДМАХО́ЎСКІ Генрык Міхайлавіч [26.10.1810, Вільня (паводле інш. звестак маёнтак Забалацце Міёрскага р-на Віцебскай вобл.) — 26.5.1863], бел.

Г.М.Дмахоўскі.

скульптар, удзельнік рэв. руху на Беларусі, у Літве і Польшчы ў 1830—60-я г. Скончыў Віленскі ун-т (1828). Удзельнік паўстання 1830—31 (у атрадзе В.Пяткевіча). Пасля яго разгрому эмігрыраваў у Францыю, дзе ў 1832—33 з рэв. эміграцыяй рыхтаваў новае паўстанне (т.зв. экспедыцыя Ю.Заліўскага). За рэв. дзейнасць у Галіцыі засуджаны аўстр. ўладамі (1834—41). У 1841—51 вывучаў скульптуру і працаваў як скульптар у Парыжы, з 1851 у ЗША, з 1861 на радзіме. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1863—64 (паўстанскі камісар Дзісенскага пав. і нач. атрада). Загінуў у баі ў в. Парэчча Барысаўскага пав. Стварыў помнікі В.Пяткевічу (1848), героям паўстання 1848 у Познані (1849), жонцы ў Філадэльфіі, Б.Радзівіл, рэльеф Ю.Заліўскага, бюсты Т.Касцюшкі, К.Пуласкага, Т.Джэферсана (для кангрэса ЗША), Т.Дзялынскага (Познань), У.Сыракомлі (Вільня), гісторыка М.Балінскага, статую св. Уладзіслава, скульпт. групу «Гарыбальдзі з воінамі», медаль «Апафеоз Т.Касцюшкі», медальён з сілуэтамі павешаных дзекабрыстаў і інш.

Літ.: Кісялёў Г. Адысея паўстанца-скульптара // Кісялёў Г. Героі і музы. Мн., 1982. *Г.В.Кісялёў.*

ДМАХО́ЎСКІ Уладзіслаў Вікенцьевіч (1841, Вільня — ?), бел. жывапісец. Сын мастака В.*Дмахоўскага*. Вучыўся ў бацькі і ў Варшаве. З 1875 выкладаў маляванне ў гімназіях (Чанстахова, Польшча). З канца 1870-х г. жыў і працаваў у маёнтку Нагародавічы (Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл.). Сярод твораў жанравыя карціны («Рамізнік», «Паштовая станцыя», «На начлезе»), акварэлі («У Вільню на карнавал» і інш.), у якіх паказана жыццё дробнамаянтковай шляхты. Узельнічаў у дэкар. афармленні Марыяцкага касцёла ў Кракаве.

Літ.: Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974.

ДМАХО́ЎСКІ Фадзей Уладзіслававіч (1858, каля г. Пінск — ?), бел. жывапісец і графік. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1873—77), у Кракаве ў Я.*Матэйкі*. У 1907 выкладаў арнаментыку ў Вышэйшай школе заахвочвання мастацтваў у Пецярбургу. Пісаў кампазіцыі на гіст. тэмы і пейзажы («Прысяга князя», «Лясная глуш»). Аўтар серыі малюнкаў гербаў бел. гарадоў для «Гербоўніка літоўскага», які публікаваўся ў пач. 20 ст. ў віленскіх час. «Kwartalnik Litewski» («Квартальнік літоўскі») і «Litwa i Rus» («Літва і Русь»). Вядома яго графічная серыя партрэтаў польскіх каралёў (Леха, Крака, Мешкі II, Пяста і інш.), гіст. асоб (Т.Касцюшкі, Напалеона) і дзеячаў культуры (А.Міцкевіча і інш.).

Літ.: Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974. *Л.Н.Дробаў.*

ДМО́ЎСКІ (Dmowski) Раман Станіслаў (9.8.1864, Камёнак, каля Варшавы, Польшча — 2.1.1939), польскі паліт. дзеяч, публіцыст. Ідэолаг польскага нацыяналізму. Скончыў Варшаўскі ун-т (1890). З 1888 чл. тайнай арг-цыі «Саюз польскай моладзі», з 1890 — Польскай лігі, якую ў 1893 разам з З.Баліцкім ператварыў у Нац. лігу. Заснавальнік (1895) і выдавец час. «Przegląd Wszechpolski» («Усяпольскі агляд»), на старонках якога сфармуляваў праграму польскага нац. руху. У 1907—09 дэпутат і кіраўнік «Польскага кола» (аб'яднанне польскіх дэпутатаў) у рас. 2-й і 3-й Дзярж. думах. У 1917 у Парыжы арганізаваў Польскі нац. к-т, мэтай якога было аднаўленне незалежнай Польшчы. У 1923 міністр замежных спраў. Пасля прыходу да ўлады Пілсудскага ў 1926 стварыў апазіцыйны «Лагер Вялікай Польшчы». Адмоўна ставіўся да бел. нац. руху, лічыў, што ўся Зах. і Цэнтр. Беларусь павінна ўваходзіць у склад польскай дзяржавы, выказваўся за асіміляцыю беларусаў і ўкраінцаў. Распрацаваў асновы нац.-дзярж. арганізацыі 2-й Рэчы Паспалітай. Аўтар кн. «Германія, Расія і польскае пытанне» (1908), «Польская палітыка і аднаўленне польскай дзяржавы» (1925), «Царква, народ, дзяржава» (1927), «Пасляваенны свет і Польшча» (1931).

Літ.: Wapiński R. Roman Dmowski. Lublin, 1988.

ДМУХА́ЙЛА Іван Сямёнавіч (н. 23.9.1914, с. Топчына Днепрапятроўскай вобл., Украіна), бел. жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1996). Скончыў Днепрапятроўскае маст. вучылішча (1939). Сярод работ у гіст. жанры: «Вызваленне Заходняй Беларусі» (1949), «Першая баразна» (1950), «Вызваленне» (1951) і інш. Аўтар пейзажаў «Беларускія далячыні» (1953), «Ранняя вясна», «Восень» (абедзве 1956), «На ўзлессі» (1965), «Світае» (1970), «Зялёны лог» (1973), «Песня жыцця», «На радзіме Янкі Купалы» (абедзве 1975), «Сказ пра Белавежскую пушчу» (1978, трыпціх), «Азёрны край», «Беларускія пейзажы» (абедзве 1990-я г.) і інш. Творы Д. адметныя тонкім успрыманнем зменлівага жыцця прыроды, яе прыгажосці і непаўторнасці. *Г.А.Фатыхава.*

І.Дмухайла. Снег пайшоў. 1985.

ДНЕПР, рака, гл. *Дняпро*.

ДНЕ́ПРА-ДАНЕ́ЦКАЯ КУЛЬТУ́РА, грабеньчата-накольчатай керамікі культура, археалагічная культура плямён эпохі неаліту (5—3-е тыс. да н.э.), якія жылі на тэр. Усх. Палесся і паўн.-ўсх. Украіны. Вядома 250 помнікаў, з іх палова на тэр. паўд.-ўсх. Беларусі. Могільнікі (больш за 20) выяўлены толькі на тэр. Украіны.

Насельніцтва займалася паляваннем, рыбалоўствам, пазней земляробствам і жывёлагадоўляй. Жыгды наземныя або заглыбленыя ў зямлю з агнішчам унутры, пл. 6—10 м². Пахавальны абрад трупапалажэнне на спіне ў яме, пасыпанне вохрай. Асн. форма керамікі — прысадзісты шыракагорлы і вастрадонны гаршчок з прамым вянцом, упрыгожаны адбіткамі грэбеня, трохвугольнымі наколамі і рыскамі, радамі глыбокіх ямак. Крамянёвы інвентар — пласціністыя і трохвугольныя наканечнікі стрэл, скрабкі, нізкія трапецыі, вузкія і шырокія нажы, кароткія сегментападобныя сярпы, праколкі, вастрыі і інш., касцяныя прылады. *У.Ф.Ісаенка.*

ДНЕ́ПРА-ДЗВІ́НСКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура ўсходнебалцкіх плямён, якія ў 8 ст. да н.э. — 4—5 ст. н.э. жылі ў Верхнім Падняпроўі, Сярэднім Падзвінні і ў вярхоўях р. Вялікая. Асн. тып пасяленняў — умацаваныя пасёлкі-гарадзішчы плошчай ад 500 да 2500 м² (на Беларусі каля 200). Жылыя пабудовы наземныя, слупавой канструкцыі.

Насельніцтва займалася паляваннем, рыбалоўствам, жывёлагадоўляй, пазней лядным земляробствам і рамёствамі. Сярод знаходак пераважаюць вырабы з каменю і косці (каменныя клінападобныя і свідраваныя сякеры, зерняцёркі і інш.), на познім этапе (1—5 ст. н.э.) — жал. прылады і зброя (сярпы з шырокім лязом і выгнутай спінкай, нажы, шылы, наканечнікі коп'яў і стрэл і інш.). Кераміка — гладкасценны слабапрафіляваны посуд,



Посуд **днепра-данецкай культуры**. Рэканструкцыя.

Прылады працы, упрыгожанні і керамika **днепра-дзвінскай культуры**.

пераважна слоікападобных формаў, арнаментаваны скразнымі адтулінамі, пракрэсленымі касымі лініямі, ямкавымі ўшчыпваннямі. У навук. ўжытак тэрмін «Д.-дз.к.» ўвёў А.Р.*Мітрафанаў.*

Літ.: Шадыро В.И. Ранний железный век северной Белоруссии. Мн., 1985.

В.І.Шадыра.

ДНЕПРАДЗЯРЖЫ́НСК, горад на Украіне, у Днепрапятроўскай вобл. Вядомы з 1750, да 1936 Каменскае. 279 тыс. ж. (1987). Порт на р. Дняпро. Чыг. станцыя. Чорная металургія, хім., маш.-буд. (вагонабудаванне, вытв-сць кацельнага абсталявання і інш.), энергет., мэблевая, лёгкая, харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. ТЭЦ. ГЭС. Індустрыяльны ін-т. Музей гісторыі горада.

ДНЕПРАПЯТРО́ЎСК, горад на Украіне, цэнтр Днепрапятроўскай вобл. Засн. ў 1776, у 1796—1812 Новарасійск, да 1926 Екацярынаслаў. 1190 тыс. ж. (1993). Порт на р. Дняпро. Чыг. вузел. Буйны прамысл. цэнтр Украіны. Гал. галіны: чорная металургія, машынабудаванне і металаапрацоўка (металургічнае і горна-шахтавае абсталяванне, станкабудаванне, с.-г. машынабудаванне і інш.), хім. (азотныя ўгнаенні, сінт. смолы, пластмасы, шыны, фарбы), лёгкая (трыкат., швейная), харч.; вытв-сць буд. матэрыялаў. Днепрапятроўскі цэнтр АН Украіны. 9 ВНУ (у т.л. 2 ун-ты), 5 т-раў, 3 музеі. Палац Пацёмкіна (канец 18 ст., цяпер Палац студэнтаў), Праабражэнскі кафедральны сабор (19 ст.).

ДНЕПРАПЯТРО́ЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ПдУ Украіны. Утворана 27.2.1932. Пл. 31,9 тыс. км². Нас. 3852 тыс. чал. (1996), гарадскога — 84%. Цэнтр — г. *Днепрапятроўск*. Найб. гарады: Крывы Рог, Днепрадзяржынск, Нікапаль, Новамаскоўск, Паўладар, Марганец, Жоўтыя Воды, Сінельнікава.

Прырода. Рэльеф пераважна раўнінны, на З Прыдняпроўскае ўзв. (выш. да 192 м), у цэнтр. ч. Прыдняпроўская нізіна, якая на Пд пераходзіць у Прычарнаморскую нізіну, на ПдУ Прыазоўскае ўзв. (выш. да 211 м). Карысныя выкапні: жалезныя, марганцавыя, нікелевыя і тытанавыя руды, каменны і буры вугаль, прыродны газ, графіт, баксіты, вапнякі, граніты, гнейсы, гліны і інш. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -5 да -6,5 °С, ліп. ад 22 да 23,5 °С. Гадавая колькасць ападкаў ад 450 мм на Пн да 400 мм на Пд. Гал. рака Дняпро з прытокамі Арэль, Самара (злева), Мокрая Сура, Базаўлук, Інгулец (справа). Пабудаваны Днепрадзяржынскае і Кахоўскае вадасх., канал Дняпро—Крывы Рог, вадавод з Дняпра ў Кіраваградскую вобл. Глебы пераважна чарназёмныя, па далінах рэк чарназёмна-лугавыя. Стэп распараны. Лясы займаюць невял. плошчы (дуб, ясень, граб, клён).

Гаспадарка. Д.в. — адна з найб. індустрыяльна развітых на Украіне. Здабыча жал. (Крывароскі бас.), марганцавых (Нікапальскі бас.), поліметал. руд, каменнага вугалю (зах. ч. Данбаса). Вядучыя галіны прам-сці: чорная (чыгун, сталь, пракат, стальныя трубы і інш.) і каляровая (уран) металургія, машынабудаванне і металаапрацоўка (металургічнае і горна-шахтавае абсталяванне, электравозы, чыг. вагоны, станкі, прэсы, буракаўборачныя камбайны, прылады, радыётэхніка), коксахім., хім. і нафтахім. (азотныя ўгнаенні, пластмасы, шыны, лакі, фарбы і інш.), лёгкая (швейныя вырабы, верхні трыкатаж, абутак), дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая (у т.л. вытв-сць мэблі і паперы), харч. (алей, мука, крупы і інш.). Вытв-сць буд. (цэмент) і вогнетрывалых матэрыялаў. Прыдняпроўская, Крыварожская, Днепрадзяржынская і інш. ДРЭС, Днепрадзяржынская ГЭС. Пасевы пшаніцы, ячменю, кукурузы, проса, грэчкі; вырошчваюць сланечнік, сою, цукр. буракі, агародніну, бульбу. Пладаводства, вінаградарства. Мяса-малочная жывёлагадоўля. Рыбалоўства. Буйныя арашальныя сістэмы. Асн. від транспарту — чыгуначны. Чыгункі: Крывы Рог—Днепрапятроўск—Чырвонаармейск, Далінская—Запарожжа і інш. Аўтамаб.

транспарт выкарыстоўваецца ў асн. для ўнутр. перавозак. Газаправоды: Шабялінка (Харкаўская вобл.) — Днепрапятроўск — Крывы Рог, Перашчэпіна—Днепрапятроўск, Крамянчуг—Крывы Рог, транзітныя нафтаправоды. Суднаходства па Дняпры. Рачныя парты: Днепрапятроўск, Днепрадзяржынск, Нікапаль. Бальнеагразевы курорт Салёны Ліман. *Г.С.Смалякоў.*

ДНЕСТР (малд. Ністру), рака на ПдЗ Украіны і ў Малдове (часткова на мяжы гэтых краін). Даўж. 1352 км. Пл. вадазбору 72,1 тыс. км². Бярэ пачатак на паўн.-ўсх. схілах Укр. Карпат на выш. каля 900 м. Упадае ў Дняпроўскі ліман Чорнага м. У вярхоўях — горная рака, ніжэй г. Галіч (Украіна) цячэнне больш спакойнае. У нізоўях цячэ ў шырокай даліне па Прычарнаморскай нізіне. Асн. прытокі: Стрый, Рэут (справа), Серэт, Збруч (злева). Жыўленне дажджавое і снегавое. Летнія паводкі; ледастаў (са снеж. да сак.) няўстойлівы.

Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 339 м^3/с. На Д. — Дубасарская ГЭС і вадасховішча. Выкарыстоўваецца для арашэння, лесасплаву (у вярхоўях). Суднаходная ад г. Сарока (Малдова) да вусця (з перарывам каля Дубасарскай ГЭС). На Д. гарады Сарока, Рыбніца, Бендэр, Цірaспаль (Малдова), Магілёў-Падольскі (Украіна).

ДНІПРО́ВА ЧА́ЙКА (сапр. Васілеўская Людміла Аляксееўна; 1.11.1861, с. Зялёны Яр Мікалаеўскай вобл., Украіна — 13.3.1927), украінская пісьменніца. Скончыла гімназію ў Адэсе (1879). Майстар інтымнай і грамадз. лірыкі. Аўтар рытмізаваных лірычных мініяцюр, адметных сац. сімволікай, рамант. пафасам і філас. роздумам аб сэнсе жыцця: «Дзяўчына-чайка» (1892), «Скала» (1893), «Буравеснік» (1900), «Плаўні гараць» (1902) і інш. Побыт укр. сялянства і інтэлігенцыі канца 19 — пач. 20 ст. адлюстраваны ў апавяданнях «Знахарка» (1885), «Крыжанос» (1896), «У школе» (1909). Вядома як збіральніца фальклору, перакладчыца.

Тв.: Вибрані творы. Київ, 1987.

Літ.: Пінчук В.Г. Дніпрова Чайка. Київ, 1984. *В.А.Чабаненка.*

ДНІ́ШАЎ Алібек Мусаевіч (н. 30.7.1951, Алматы), казахскі спявак (тэнар). Нар. арт. Казахстана (1981), нар. арт. СССР (1986). Скончыў Алма-Ацінскую кансерваторыю (1976). З 1976 саліст Каз. філармоніі, з 1978 — Каз. т-ра оперы і балета. Мае моцны голас прыгожага мяккага тэмбру, вял. дыяпазону. Выконвае гал. партыі тэнаровага рэпертуару ў операх класікаў, сучасных айч. і замежных кампазітараў. Сярод іх: Тулеген («Кыз Жыбек» Я.Брусілоўскага), Ленскі («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Альфрэд («Травіята» Дж.Вердзі) і інш. У канцэртным рэпертуары неапалітанскія, рус. нар. песні, рамансы. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя Глінкі (1975), міжнар. конкурсаў імя Р.Шумана (г. Цвікаў, Германія, 1977), вакалістаў у Рыо-дэ-Жанейра (1979). Прэмія Ленінскага камсамола 1979.

ДНЯПРО́, Днепр (стараж.-грэч. Барысфен, укр. Славуціч), рака ў Расіі, у Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абл. Беларусі і на Украіне; трэцяя па даўжыні і плошчы басейна ў Еўропе (пасля Волгі і Дуная). Даўж. 2145 км, на Беларусі 689 км, у т.л. на мяжы Расіі і Беларусі 17 км, у Беларусі да Лоева 562 км і 110 км на мяжы Беларусі і Украіны. Пл. вадазбору 504 тыс. км^2, у т.л. на Беларусі 118 тыс. км^2. Пачынаецца з невял. балота на Валдайскім узв. (Смаленская вобл., Расія), упадае ў Дняпроўскі ліман Чорнага м. Вярхоўі вадазбору ў межах Смаленскага ўзв., правабярэжжа сярэдняй ч. верхняга цячэння на Цэнтральнабярэзінскай раўніне, левабярэжжа на Аршанска-Магілёўскай раўніне, што на Пд пераходзіць у нізіну Беларускага Палесся. На Пд ад г. Рагачоў па левабярэжжы ракі цягнецца Прыдняпроўская нізіна. У вярхоўі даліна добра распрацаваная, трапецападобная, шыр. 600 м — 1 км. Пойма двухбаковая, чаргуецца па берагах, шыр. ад 50 м да 1,5 км. Рэчышча свабодна меандруе. У межах Беларусі даліна пераважна трапецападобная, ніжэй вусця р. Сож невыразная, шыр. ад 800 м да 10 км, у межах Палескай нізіны зліваецца з прылеглай мясцовасцю. Пойма на значным працягу ад Магілёва — двухбаковая тэраса, шыр. яе ад 1 да 10 км у межах Гомельскага Палесся. Рэчышча на вял. працягу моцнавілістае, багатае перакатамі і мелямі, найб. выразнымі на ўчастку паміж вусцямі рэк Друць і Сож. За 9 км вышэй г. Орша рака праразае граду дэвонскіх вапнякоў, утварае т.зв. Кабяляцкія парогі, даўж. якіх каля 200 м. У сярэднім цячэнні даліна Д. шыр. 6—10 км. Правы бераг узвышаны і стромкі, абрываецца да ракі. Каля г. Канеў даліна звужаецца да 2 км. Паміж гарадамі Днепрапятроўск і Запарожжа Д. перасякае гранітны масіў, дзе да буд-ва Днепрагэса былі Дняпроўскія парогі. У нізоўях Д. цячэ па Прычарнаморскай нізіне, шыр. поймы 23 км. Асн. прытокі на Беларусі: Адроў, Лахва, Друць, Бярэзіна, Прыпяць (справа), Ухлясць, Ржаўка, Сож (злева). Сярэдні і ніжні Д. ў асноўным — каскад ГЭС (з вадасховішчамі): Кіеўская, Канеўская, Крамянчугская, Днепрадзяржынская, Дняпроўская, Кахоўская. У сярэднім цячэнні гал. прытокі Рось (справа), Сула, Псёл, Ворскла, Самара (злева); у ніжнім — Базаўлук, Інгулец (справа), Конка (злева). Асноўны сцёк ракі фарміруецца ў верхнім цячэнні. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 1670 м^3/с. Ледастаў з снеж. да сак. ў нізоўі і да пач. крас. ў вярхоўі. Воды Д. выкарыстоўваюцца для водазабеспячэння і арашэння (каналы: Д. — Крывы Рог, Д. — Данбас, Паўночна-Крымскі арашальны). Суднаходны ад вусця да г. Дарагабуж. Д. злучаны з бас. Віслы *Дняпроўска-Бугскім каналам*, з бас. Нёмана — *Агінскім каналам*, з бас. Зах. Дзвіны — *Бярэзінскім каналам*. На правым беразе Д. Канеўскі запаведнік. Асн. гарады: Дарагабуж, Смаленск (Расія), Орша, Шклоў, Магілёў, Быхаў, Рагачоў, Жлобін, Рэчыца (Беларусь), Кіеў, Чаркасы, Крамянчуг, Днепрапятроўск, Запарожжа, Нікапаль, Херсон (Украіна).

А.А.Макарэвіч.

ДНЯПРО́ЎСКА-БРА́ГІНСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, у Лоеўскім р-не Гомельскай вобл., за 18 км на ПнЗ ад г. Лоеў, паміж вёскамі Рэкорд і Бушацін. Створана на р. Дняпро (1149 км ад вусця) у 1987. Пл. 9,68 км^2, даўж. 4,5 км, найб. шыр. 3 км, найб. глыб. 6,2 м, аб'ём вады 42,8 млн. м^3. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель і рыбагадоўлі.

ДНЯПРО́ЎСКА-БУ́ГСКАГА КАНА́ЛА АБАРО́НА 1944, абарона Дняпроўска-Бугскага канала фарміраваннямі Брэсцкага і Пінскага партыз. злучэнняў у Вял. Айч. вайну ў лют.—сак. 1944.

Гітлераўскае камандаванне групы армій «Цэнтр» вырашыла ачысціць раён паміж р. Прыпяць і Дняпроўска-Бугскім каналам ад партызан, каб прадухіліць іх злучэнне з часцямі Чырв. Арміі. Для барацьбы з карнікамі была арганізавана часовая групоўка партыз. сіл Паўднёвай зоны, якая налічвала каля 6 тыс. чал. Больш за месяц (з 21.2.1944 па 31.3.1944) партызаны вялі баі з вял. групоўкай праціўніка, гэтым істотна дапамаглі Чырв. Арміі, якая вяла тут наступленне. У в. Зарэчка Драгічынскага р-на ў гонар бел. партызан пастаўлены помнік.

ДНЯПРО́ЎСКА-БУ́ГСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, у Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл., за 27 км на ПдУ ад г. Кобрын. Створана ў 1986 на канале Арэхаўскі (бас. р. Мухавец), за 8 км ад вусця. Пл. 1,47 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 1,1 км, найб. глыб. 9,2 м, аб'ём вады 7,1 млн. м^3. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель і рыбагадоўлі.

ДНЯПРО́ЎСКА-БУ́ГСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1943. Праведзена партыз. брыгадай імя Молатава Пінскай вобл. (камандзір М.І.Герасімаў) з мэтай вывесці са строю шлюзы, плаціны і вадаспускі Дняпроўска-Бугскага канала і сарваць перавозкі праціўніка. Распрацавана БШПР у канцы 1942.



Арашальная сістэма на р. Днестр.

Рака Дняпро.

У люг.—сак. 1943 дыверсійныя групы атрадаў імя Лазо, імя Кутузава, імя Суворава вывелі са строю шлюзы Оўзіцкі, Ляхавіцкі, Рагадашчанскі, у маі — Перарубе і Радастаўскі на Белаазерскім канале. У пач. лета 1943 працоўнік спрабаваў аднавіць Дняпроўска-Бугскі канал. З гэтай мэтай прыбыла аднаўленчая каманда, якую прыкрывалі 6 ваен. катэраў рачной флатыліі. Пачаліся рамонтныя работы. Даведаўшыся аб намерах працоўніка, камандаванне брыгады ў ноч на 19.6.1943 сіламі 3 атрадаў (каля 400 чал.) правяло аперацыю па вывадзе са строю Гарадзецкага, Ляхавіцкага, Оўзіцкага, Перарубскага, Селішчанскага, Старога і Новага Рагадашчанскага гідравузлоў. У выніку аперацыі ўзровень вады панізіўся да 30—60 см, 120 км канала на ўчастку Пінск—Кобрын сталі непрыгоднымі для эксплуатацыі. 129 суднаў працоўніка, якія былі перакінуты з Дняпра, засталіся ў Пінскім порце і ў ліп. 1944 захоплены Дняпроўскай ваен. флатыліяй. *А.М.Літвін.*

ДНЯПРО́ЎСКА-БУ́ГСКІ КАНА́Л, частка Дняпроўска-Бугскага воднага шляху ў Кобрынскім, Драгічынскім і Іванаўскім р-нах Брэсцкай вобл. Звязвае р. Піна (бас. р. Прыпяць) з р. Мухавец (бас. р. Зах. Буг). Агульная даўж. 95 км. У навігацыю глыб. канала да 1,6 м, шыр. ад 22 да 28 м. Вытокам канала ўмоўна лічыцца водападзел каля в. Селішча (у вусці Белаазерскага канала). Складаецца з 2 частак: Бугскай (ад вусця Белаазерскага канала да ўпадзення ў р. Мухавец каля г. Кобрын, даўж. 50 км) і Прыпяцкай (ад вусця Белаазерскага канала да ўпадзення ў р. Піна каля в. Перадуб, даўж. 45 км). Канал праходзіць па забалочанай нізіне. Асн. прытокі Бугскай ч. канала — Арэхаўскі, Валавельскі, Каралеўскі, Павіцкі Прыпяцкай ч. — Ляхавіцкі, Жыроўскі, Белаазерскі, Залядынскі, Зуброўскі каналы і р. Сасновіца. Асн. крыніцы жыўлення — перакід вады з Прыпяці праз азёры Святое, Валянскае (у межах Украіны) і Белае. Узроўневы рэжым канала рэгулюецца гідратэхн. збудаваннямі. Пабудаваны ў 1775—1848; у 1940 рэканструяваны. У Вял. Айч. вайну разбураны. У 1945—46 Д.-Б.к. адноўлены, пазней рэканструяваны. Суднаходны. Перавозяць пераважна мінер. сыравіну, буд. матэрыялы, лес. Выкарыстоўваецца таксама як водапрыёмнік меліярац. каналаў. *Г.С.Жукоўская.*

ДНЯПРО́ЎСКА-БУ́ГСКІ ЛІМА́Н, гл. ў арт. *Бугскі ліман, Дняпроўскі ліман.*

ДНЯПРО́ЎСКА-ДАНЕ́ЦКАЯ ГАЗАНАФТАНО́СНАЯ ВО́БЛАСЦЬ. На тэр. Чарнігаўскай, Сумскай, Палтаўскай, Днепрапятроўскай, Харкаўскай, Варашылаўградскай абл. Украіны і Растоўскай вобл. Расіі, уваходзіць у *Дняпроўска-Прыпяцкую газанафтаносную правінцыю*. Пл. каля 115 тыс. км^2. Прамысл. распрацоўка радовішчаў з 1952. Асн. радовішчы нафты і газу ў дэвонскіх каменнавугальных і ніжнепермскіх адкладах. Нафтавыя паклады на глыб. да 4500 м, газавыя і газакандэнсатныя — да 5000—5800 м. Буйнейшыя радовішчы: Шабялінскае, Заходне-Крэсцішчанскае, Яфрэмаўскае (газакандэнсатныя), Глінска-Розбышаўскае, Гнедзінцаўскае (нафтагазакандэнсатныя), Лялякаўскае (нафтавае). Цэнтры па разведцы і здабычы нафты і газу — гарады Чарнігаў, Прылукі, Балаклея і інш.

ДНЯПРО́ЎСКА-ДАНЕ́ЦКАЯ ЎПА́ДЗІНА, тэктанічная структура на тэр. Украіны і на крайнім ПдУ Беларусі, асн. ч. Прыпяцка-Дняпроўска-Данецкага аўлакагену. На ПнУ мяжуе з Варонежскім крышт. масівам, на ПдЗ — з *Украінскім крышталічным шчытом*, на ПдУ сучляняецца з Данецкім складкавым збудаваннем, на ПнЗ праз глыбока апушчаную *Брагінска-Лоеўскую седлавіну* зліваецца з *Прыпяцкім прагінам*.

Д.-Д.ў. мае выгляд ровападобнага прагіну, абмежаванага глыбіннымі разломамі. Даўж. больш за 700 км, шыр. 100—120 км. Макс. глыбіня залягання крышт. фундамента ў яе межах каля 12 км. Упадзіна запоўнена палеазойскімі, мезазойскімі і кайназойскімі асадкавымі ўтварэннямі, якія залягаюць на няроўнай паверхні крышт. фундамента. У межах упадзіны вылучаюць паўн. і паўд. прыбартавыя зоны ступеньчатых апусканняў і Дняпроўска-Данецкі грабен, які падзяляецца на Дняпроўскі грабен, зону сучлянення з Данецкім складкавым збудаваннем і Чарнігаўска-Брагінскі выступ. На тэр. ўпадзіны інтэнсіўна выявілася саляная тэктоніка. Развівалася ўпадзіна ўздоўж буйных разломаў у крышт. фундаменце паўн.-зах. распасціравання. Пачатак фарміравання адносіцца да канца сярэдняга або пачатку позняга дэвону. Апусканне тэр. адбывалася з перапынкамі да чацвярцічнага часу. Найб. інтэнсіўна сыходныя тэктанічныя рухі выявіліся ў дэвоне і ў ранняпермскі час. У асадкавай тоўшчы Д.-Д.ў. выяўлены радовішчы нафты, газу, гіпсу, вугалю, кам. солі, мелу і інш. карысных выкапняў.

ДНЯПРО́ЎСКАЕ ЗЛЕДЗЯНЕ́ННЕ, рыскае, максімальнае ўсх.-еўрап. зледзяненне, што адбывалася з канца *александрыйскага міжледавікоўя* да пач. *шклоўскага міжледавікоўя*. Адпавядае самараўскаму зледзяненню Зах. Сібіры і *рыскаму зледзяненню* Альпаў. Мяркуюць, што працягласць Д.з. 70 тыс. гадоў (320—250 тыс. гадоў назад). Ледавік насунуўся са Скандынавіі, перакрыў усю тэр. Беларусі і пашырыўся далёка на Пд, 2 «языкамі» апусціўся па далінах Дняпра і Дона да шыраты г. Днепрапятроўск і да вусця р. Мядзведзіца. Адклады Д.з. — шэрыя і буравата-шэрыя марэнныя суглінкі і супескі з частымі ўключэннямі валуноў, адорвеняў мелу, даламіту і інш. (магутнасць больш за 50, а ў асобных выпадках — больш за 100 м). Залягаюць на больш стараж. пластах антрапагену, на Пн у глыбокіх ледавіковых лагчынах, часта на карэнных пародах. На Пд і ў цэнтр. ч. Беларусі агаляюцца на берагах рэк і яроў. Матэрыялы адкладаў Д.з. прынесены ў Беларусь з усх. Швецыі, паўд. Фінляндыі і Карэліі, Прыбалтыкі. Пад уплывам Д.з. створаны каркас сучаснага рэльефу Беларусі з градамі, узгоркамі, а таксама раўнінамі са шматлікімі азёрамі.

ДНЯПРО́ЎСКА-ПРЫ́ПЯЦКАЯ ГАЗАНАФТАНО́СНАЯ ПРАВІ́НЦЫЯ, аб'ядноўвае *Дняпроўска-Данецкую газанафтаносную вобласць* і *Прыпяцкі нафтагазаносны басейн*.

ДНЯПРО́ЎСКАЯ ВАЕ́ННАЯ ФЛАТЫ́ЛІЯ, 1) фарміраванне ВМФ Расіі ў рус.-тур. вайну 1735—39. Утворана ў 1737 у Бранску (пад камандаваннем віцэ-адм. Н.А.Сянявіна, пабудавана каля 300 невял. драўляных парусна-вёславых суднаў) і накіравана ў Дняпроўскі ліман

Аўтар А.М.Літвін

(б.ч. суднаў разбілася на дняпроўскіх парогах). Садзейнічала рас. войскам у баях за Ачакаў. Скасавана у канцы вайны. 2) Фарміраванне сав. ВМФ у бас. Дняпра ў грамадз. і польска-сав. вайну 1920 і ў 1925—40. Створана ў сак. 1919 у Кіеве. У вер. 1919 перабазіравалася ў Гомель, папоўнілася суднамі расфарміраванай *Прыпяцкай ваеннай флатыліі*. Вясной 1920 мела каля 40 баявых караблёў, у т.л. 18 кананерскіх лодак, 5 бранякатэраў і 48 дапаможных суднаў. Камандуючыя: А.В.Палупанаў, П.І.Смірноў, М.Г.Сцяпанаў. Вяла баі (з крас. 1919) на Дняпры, Прыпяці, Бярэзіне, Сажы, вызначылася ў *Лоеўскім прарыве 1920* і інш. Расфарміравана 21.3.1921. Адноўлена ў кастр. 1925 у Кіеве як атрад суднаў Д.в.ф., з 27.6.1931 зноў наз. Д.в.ф. У вер. 1939 удзельнічала ў паходзе Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь, у т.л. ў падняцці затопленых суднаў польскай Пінскай флатыліі. З кастр. 1939 гал. база — Пінск. Мела больш за 120 караблёў. Камандуючыя: М.В.Траццякоў, Б.У.Харошхін, Г.Н.Чубуноў, М.В.Абрамаў. Расфарміравана ў чэрв. 1940, караблі перададзены на фарміраванне *Пінскай ваеннай флатыліі* і Дунайскай ваен. флатыліі. 3) Аператыўнае аб'яднанне сав. рачных суднаў на зах. напрамку ў Вял. Айч. вайну і пасля яе. Сфарміравана 14.9.1943 з караблёў Волжскай ваен. флатыліі. Гал. база — Чарнігаў, з ліст. 1943 Кіеў, з ліп. 1944 Пінск. Уваходзіла ў склад Бел. і 1-га Бел. франтоў. Мела каля 200 суднаў (1945), ударную сілу складалі бранякатэры. Камандуючы — В.В.*Грыгор'еў*. Удзельнічала ў *Беларускай аперацыі 1944*, баях на Зах. Бугу на тэр. Польшчы, *Берлінскай аперацыі 1945* (фарсіраванне Шпрэе і інш.). 20 маракам прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Злучэнням і часцям, якія вызначыліся ў баях, нададзены ганаровыя найменні «Бабруйскіх», «Лунінецкіх», «Пінскіх», «Берлінскіх». Расфарміравана ў 1945 (паводле інш. звестак у 1951). У Пінску на месцы высадкі дэсанта Д.в.ф. ў 1944 створаны мемарыяльны комплекс, пастаўлены помнік маракам Д.в.ф.

Літ.: Кравцов И.Я. Моряки Днепровской военной флотилии в борьбе за власть Советов // Судостроение. 1990. № 5; Локтионов И.И. Пинская и Днепровская флотилии в Великой Отечественной войне. М., 1958. *Р.К.Паўловіч.*

«ДНЯПРО́ЎСКАЯ МАНУФАКТУ́РА», гл. *Дубровенская тэкстыльная фабрыка.*

ДНЯПРО́ЎСКАЯ НІЗІ́НА, гл. *Прыдняпроўская нізіна.*

ДНЯПРО́ЎСКІ Яўген Васілевіч (н. 26.3.1929, в. Куння Пскоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Канд. тэхн. н. (1963). Скончыў БПІ (1953). З 1965 у Ін-це тэхн. кібернетыкі АН Беларусі. Навук. працы па праблемах апрацоўкі і адлюстравання графічнай інфармацыі. Распрацаваў шэраг чарцёжных аўтаматаў і прынцыпы пабудовы лазерна-графічных дысплеяў. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Тв.: Расчет элементов лазерных сканирующих систем. Мн., 1986 (у сааўт.). *М.П.Савік.*

ДНЯПРО́ЎСКІ ВУ́ГАЛЬНЫ БАСЕ́ЙН, аб'ядноўвае шматлікія ізаляваныя радовішчы на тэр. Днепрапятроўскай, Запарожскай, Жытомірскай, Вінніцкай, Кіеўскай, Чаркаскай, Кіраваградскай абл. Украіны. Пл. каля 150 тыс. км^2; распасціраецца пераважна па правабярэжжы р. Дняпро на 680 км пры шыр. да 150 км. Вугляноснасць басейна звязана з палеагенавымі адкладамі, якія залягаюць на крышт. пародах Украінскага масіву. Разведаныя запасы вугалю 2,4 млрд. т.

Наяўнасць вуглёў вядома з 16 ст. Інтэнсіўнае асваенне з 1946. Магутнасць вугляноснай тоўшчы да 55 м, глыб. залягання ад 5 да 160 м. Вугалі бурыя, тэхн. групы Б1. Цеплыня згарання на рабочае паліва 9,2 МДж/кг. Здабыча вядзецца разрэзамі і шахтамі. Цэнтр — г. Александрыя.

ДНЯПРО́ЎСКІ ЛІМА́Н, заліў Чорнага м. каля берагоў Украіны. Уразаецца ў сушу на 55 км. Шыр. 7,4—16,7 км, глыб. каля 5 м. На З адгароджаны ад мора нізкай пясчанай Кінбурнскай касой. Злучаны з Чорным м. пралівам шыр. 4,3 км. Зімой замярзае. У Д.л. упадаюць рэкі Дняпро і Паўд. Буг, які ў ніжнім цячэнні ўтварае *Бугскі ліман*. На Д.л. порт Ачакаў.

ДНЯПРО́ЎСКІЯ ПАРО́ГІ, выхады карэнных горных парод у рэчышчы р. Дняпро паміж гарадамі Днепрапятроўск і Запарожжа. Існавала 10 парогаў і 30 каменных град агульнай даўж. каля 75 км (пры вышыні падзення вады каля 40 м). Знаходзіліся на шляху «з варагаў у грэкі», перашкаджалі суднаходству, бы-

Помнік маракам **Дняпроўскай ваеннай флатыліі** каля в. Чыркавічы Светлагорскага р-на (злева) і бранякатэр флатыліі — фрагмент мемарыяльнага комплексу вызваліцелям у Пінску (справа).

лі месцам нападзенняў качэўнікаў на судны. Ніжэй парогаў у 16 ст. заснавана Запарожская Сеч; у 17—18 ст. каля Д.п. стаяла крэпасць Кодак. Затоплены водамі Дняпроўскага вадасховішча.

ДНЯПРЭ́Ц, рака ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. Быстрая (бас. Дняпра). Даўж. 25 км. Пл. вадазбору 71 км^2. Пачынаецца за 1 км на ПнУ ад в. Зайцава. Цячэ па паўд. схілах Смаленскага ўзв. і па Горацка-Мсціслаўскай раўніне. На рацэ вадасх. *Дняпрэц.*

ДНЯПРЭ́Ц, вадасховішча ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл., за 7 км на У ад г. Горкі, каля вёсак Буды, Кварцяны, Паляшчыцы. Створана на р. *Дняпрэц* у 1979. Пл. 0,98 км^2, даўж. 6 км, найб. шыр. 300 м, найб. глыб. 9 м, аб'ём вады 4,4 млн. м^3. Слабапраточнае. Ваганні ўзроўню на працягу года 5 м. Выкарыстоўваецца для арашэння.

ДНЯСТРО́ЎСКІ ЛІМА́Н, заліў Чорнага м., з якім злучаны вузкім пралівам; затопленае вусце р. Днестр. Пл. 360 км². Даўж. 41 км, шыр. 4—12 км, глыб. 2,6 м. Зімой часткова замярзае. На Д.л. гарады Белгарад-Днястроўскі, Авідзіопаль.

«ДО ВА́ЛЬКІ» («Do walki», «На барацьбу»), газета, орган ЦК КПЗБ. Выдавалася нелегальна з ліст. 1928 да жн. 1932 у Вільні на польскай мове. Асвятляла паліт. і эканам. становішча ў краіне. Выступала ў абарону інтарэсаў працоўных Зах. Беларусі. Выкрывала антынар. палітыку ўрада Польшчы, адмяжоўвалася ад згодніцкіх і нацыяналістычных партый і іх лідэраў. Выходзіла да 6 нумароў у год (вядомы 23 нумары).

С.В.Говін.

ДО́БАСНА, Дабасна, Добысна, рака ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл., Рагачоўскім і Жлобінскім р-нах Гомельскай вобл., правы прыток р. Дняпро. Даўж. 81 км. Пл. вадазбору 874 км². Пачынаецца каля пас. Скачок Кіраўскага р-на. Цячэ ў межах паўн. ч. Гомельскага Палесся. Даліна ў верхнім цячэнні невыразная, ніжэй трапецападобная, шыр. 700—900 м. Пойма двухбаковая, яе шыр. 200—300 м. Рэчышча каналізаванае амаль на ўсім працягу. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 4 м³/с. На рацэ вадасх. *Добасна.*

ДО́БАСНА, вадасховішча ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл., за 10 км на У ад г.п. Кіраўск, каля вёсак Лешчанка, Кісцяні, Барчыцы і Новая Добасна. Створана на р. *Добасна* ў 1969. У 1974—81 рэканструявана. Пл. 1,68 км², даўж. 6,5 км, найб. шыр. 700 м, найб. глыб. 2,5 м, аб'ём вады 1,9 млн. м³. Берагі выш. да 2 м, пад ворывам і хмызняком. Дно выслана торфам і пяском. Выкарыстоўваецца для арашэння і рыбагадоўлі.

ДО́БІ (Dobi) Іштван (31.12.1898, с. Сёнь, медзье Комарам, Венгрыя — 24.11.1968), венгерскі паліт. і дзярж. дзеяч. Чл. Партыі дробных сельскіх гаспадароў (з 1934), кіраўнік левага крыла (з 1937) і старшыня гэтай партыі (1947—52). Удзельнік Руху Супраціўлення ў 2-ю сусв. вайну. Старшыня СМ Венгрыі (1948—52). У 1950—60-я г. на кіруючых пасадах у с.-г. кааперацыі, чл. і адзін з кіраўнікоў Венг. сацыяліст. рабочай партыі. Герой Сац. Працы Венг. Нар. Рэспублікі (1967).

Тв.: Рус. пер. — Исповедь и история: Воспоминания. М., 1967.

ДО́БІЯШ (Dobiáš) Вацлаў (22.9.1909, Радчыцы, каля г. Семілі, Чэхія — 1978), чэшскі кампазітар, муз. дзеяч. Нар. арт. ЧССР (1976). Вучыўся ў кансерваторыі (1932—37) і ў Школе вышэйшага майстэрства (1937—39) у Празе. Праф. пражскай Акадэміі прыгожых мастацтваў (з 1950). Старшыня Саюза кампазітараў ЧССР (1955—63). Старшыня Камітэта муз. фестывалю «Пражская вясна» (да 1978). Сярод асн. твораў: 3 кантаты, у т.л. «Будуй Радзіму — умацуеш мір» (3-я рэд. 1950, Залаты медаль Міру Сусв. Савета Міру); 3 сімфоніі (1943, 1957, камерная 1939), 4 стр. квартэты, санет «Аб роднай краіне» і інш., фп. п'есы, санаты, вак. цыклы, масавыя песні, музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Дзярж. прэмія ЧССР 1952.

ДО́БРААХВО́ТНАЕ СТРАХАВА́ННЕ, гл. ў арт. *Страхаванне.*

ДО́БРААХВО́ТНАЕ ТАВАРЫ́СТВА САДЗЕ́ЙНІЧАННЯ А́РМІІ, АВІЯ́ЦЫІ І ФЛО́ТУ БССР (ДТСААФ БССР), назва да 1991 *Беларускага абароннага спартыўна-тэхнічнага таварыства* (БелАСТТ).

ДО́БРАВІЧ (Dobrović) Нікола (12.11.1897, г. Печ, Венгрыя — 11.1.1967), сербскі архітэктар і горадабудаўнік, прадстаўнік *функцыяналізму*. Чл. Сербскай акадэміі навук і мастацтваў (з 1965). Скончыў Вышэйшую тэхн. школу ў Празе (1923). У 1946—67 дырэктар Сербскага горадабуд. ін-та і гал. архітэктар г. Бялград. Аўтар Дома югасл. студэнтаў у Празе (1932), гасцініцы на в-ве Лопуд каля г. Дуброўнік (1936), ген. планаў гарадоў Бялграда (1947—50, разам з М.Самборскім), Штып (1952), Херцэгнові (1957) і інш.

ДО́БРАЕ ВО́ЗЕРА, у Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., у пойме р. Дняпро, за 5 км на Пд ад г. Рагачоў. Пл. 0,28 км², даўж. 1,1 км, найб. шыр. 120 м. Старычнае. Усх. бераг пад лесам. На Пн злучана ручаём са старыцамі.

ДО́БРАЙ НАДЗЕ́І МЫС (англ. Cape of Good Hope), скалісты мыс на Пд Афрыкі (34°21′ паўд. ш. і 18°30′ усх. д.), у Паўд. Афр. Рэспубліцы. Партуг. мараплаўца Б.Дыяш, які адкрыў мыс у 1488, назваў яго мысам Бур, але партуг. кароль Жуан II перайменаваў яго ў Д.н.м., спадзеючыся дасягнуць адсюль Індыі.

ДО́БРАНАДЗЕ́ЙНАСЦЬ, адно з маральна-этычных і паліт. паняццяў, якое адлюстроўвае адносіны дзяржавы і яе спец. органаў, грамадскіх і інш. арг-цый да асобы. Па меры развіцця грамадства ўдакладняўся і ўскладняўся механізм кантролю за грамадска-паліт. і асабістым жыццём грамадзян, іх адносінамі да рэлігіі, палітыкі дзяржавы і яе мясц. органаў. Са з'яўленнем тэхнатронных сродкаў і камп'ютэрызацыі з'явілася магчымасць татальнага нагляду за Д. грамадзян у межах дзяржавы і міжнар. маштабе.

На Беларусі ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай за Д. грамадзян назіралі царква і прадстаўнікі ўлады, у Расіі спец. дзярж. орган — жандармерыя, пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 — органы ДПУ, АДПУ, НКУС, КДБ.

ДО́БРАСЦЬ, Задобрасць, рака ў Крычаўскім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. Сож (бас. Дняпра). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 87 км². Пачынаецца за 2 км на ПнЗ ад в. Дарлівае. Цячэ па Аршанска-Магілёўскай раўніне. Ад вытокаў да в. Касцюшкавічы (8,8 км) і на працягу 1,8 км на прывусцевым участку рэчышча каналізаванае. Каля в. Калініна на рацэ плаціна і сажалка.

ДО́БРАЎСКІ (Dobrovský) Іосеф (17.8.1753, Дзьярмат, каля г. Дзьёр, Венгрыя — 6.1.1829), чэшскі асветнік-славіст. Адзін з заснавальнікаў *славяназнаўства*, дзеяч чэш. Адраджэння. Вучыўся ў Пражскім ун-це (1768—76). Чл. Каралеўскага т-ва навук у Празе (з 1784), ганаровы чл. Рас. АН (з 1820) і акадэмій інш. краін. Заклаў асновы параўнальнага вывучэння славянскіх моў, культуры і гісторыі. Аўтар прац «Гісторыя чэшскай мовы і літаратуры» (1792), «Глагалітыка» (1807), «Асновы старажытнаславянскай мовы» (1822), цыкла артыкулаў «Крытычныя спробы ачышчэння чэшскай гісторыі ад пазнейшых выдумак» (1803—19) і інш. Выдаваў навук. славістычныя зб-кі «Славін» (1806—08) і «Славанка» (1814—15).

Тв.: Spisy a projevy. Sv. 5—23. Praha, 1936—63.

ДО́БРАЯ, вёска ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Дабранка, каля аўтадарогі Магілёў—Княжыцы—Горкі. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 9 км на Пд ад Горак, 77 км ад Магілёва, 7 км ад чыг. ст. Пагодзіна. 447 ж., 148 двароў (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ДО́БРУШ, горад абл. падпарадкавання ў Гомельскай вобл., цэнтр Добрушскага р-на, на р. Іпуць. За 25 км ад Гомеля. Чыг. станцыя на лініі Гомель—Унеча, аўтадарогамі злучаны з Гомелем, Веткай, Церахоўкай, Навазыбкавам (Расія). 20 тыс. ж. (1997).

Вядомы з 1560 як вёска Гомельскага староства Рэчыцкага пав. ВКЛ. З 1772 у Рас. імперыі, з 1777 сяло Вылеўскай вол. Беліцкага, з 1852 Гомельскага пав., цэнтр Добрушскай эканоміі (аб'ядноўвала 14 навакольных вёсак). У 1776 — 587 ж., 87 двароў, 3 вадзяныя млыны, сукнавальня. У 1775 заснавала Добрушская палатняна-парусная мануфактура, каля 1795 — чыгуналіцейная, медзеапрацоўчая, мукамольная мануфактуры. Да 1834 належаў графу П.А.Румянцаву-Задунайскаму, потым князю І.Ф.Паскевічу і яго нашчадкам. У 1870 заснавана *Добрушская папяровая фабрыка.* У 1886 больш за 1 тыс. ж., 185 двароў. З 1887 чыг. станцыя Палескіх чыгунак. З 1903 дзейнічала група РСДРП. З крас. 1919 у Гомельскай губ. З 1922 цэнтр воласці Гомельскага пав. З 1926 фабрычна-заводскі пасёлак, цэнтр раёна, з 4.8.1927 горад у Гомельскім р-не. З 1935 цэнтр адноўленага Добрушскага р-на. З 22.8.1941 па 10.10.1943 акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі, якія загубілі ў горадзе і раёне 321 чал. Дзейнічала *Добрушскае патрыятычнае падполле.* З 7.3.1963 Д. — горад абл. падпарадкавання. У 1970 — 16,8 тыс. ж.

Добрушская папяровая фабрыка, Добрушскі фарфоравы завод, прадпрыемствы харч. прам-сці. Брацкія магілы сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Брацкая магіла чырвонагвардзейцаў і партызан. Помнік Вызвалення.

ДО́БРУШСКАЕ ГЕАЛАГІ́ЧНАЕ АГАЛЕ́ННЕ, каля г. Добруш Гомельскай вобл.; помнік прыроды рэсп. значэння (1963). Пл. 6 тыс. м^2, ахоўная зона вакол 10 тыс. м^2. Прымеркавана да ўступу карэннага берага р. Іпуць, дзе агаляюцца слаі кварцава-глаўканітавых пяскоў харкаўскай світы палеагену, што намножыліся 65—30 млн. г. назад у стараж. моры. *В.Ф.Вінакураў.*

ДО́БРУШСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала са жн. 1941 да кастр. 1943. Аб'ядноўвала 6 груп, больш за 70 чал. Кіраўнік Н.С.Кулікоў, намеснік Дз.М.Гладышаў. Групы сфарміраваны з рабочых і навучэнцаў Добруша, былых ваеннаслужачых, работнікаў Добрушскага лясніцтва, з жыхароў Добруша і в. Камень. Падпольшчыкі знішчалі абсталяванне папяровай ф-кі, гаручае на Добрушскай МТС, арганізавалі выбух каля чыг. ст. Закапыцце, у выніку якога знішчана вял. колькасць ням. ваеннаслужачых. У маі 1943 на ўчастку чыг. Гомель—Бранск пушчаны пад адхон 3 эшалоны. У ліп. і вер. 1943 партызаны з дапамогай падпольшчыкаў знішчылі электрастанцыю, спалілі аўтарамонтную майстэрню, 2 цэхі, узарвалі пілараму і артыл. склад. *М.Ф.Шумейка.*

ДО́БРУШСКАЯ ПАЛАТНЯ́НА-ПА́РУСНАЯ МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1775—1831 у мяст. Добруш Гомельскага пав. (цяпер горад у Гомельскай вобл.). З 1804 — парусінавая мануфактура, з 1806 — палатняна-ткацкая. У 1828 быў 31 ткацкі станок. Вырабляла парусіну, кашульнае палатно, тонкія палотны (галандскія), ільняныя хусткі, ручнікі, абрусы і інш. Працавалі прыгонныя сяляне (у 1823 — 78 чал.).

ДО́БРУШСКАЯ ПАПЯРО́ВАЯ ФА́БРЫКА. Засн. ў 1870 кн. Ф.І.Паскевічам у мяст. Добруш (цяпер горад у Гомельскай вобл.). Вырабляла паперу рознага асартыменту з драўніннай масы і рыззя. У 1879 працавала 460, у 1913 — 1500 рабочых. Называлася т-вам Добрушскай папяровай фабрыкі (у 1880 — 550 пайшчыкаў). Выкарыстоўвалася газавае асвятленне, з 1888 — электрычнае (упершыню ў Беларусі). Палівам служылі дровы, з 1913 — вугаль. У 1894 на ф-цы (упершыню ў Рас. імперыі) уведзены 8—9-гадзінны прац. дзень. З 1883 пры ф-цы адкрыта вучылішча для дзяцей 5—12 гадоў (навучалася каля 40 чал.). У 1913 вырабляла 625 тыс. пудоў паперы. З 1922 фабрыка мела назву «Герой працы». У 1932 тут упершыню ў Еўропе распачата саломенна-цэлюлозная вытв-сць. У Вял. Айч. вайну разбурана. У 1956 рэарганізавана ў цэлюлозна-папяровы камбінат. З 1976 зноў Д.п.ф. Працуе на прывазной цэлюлозе з Расіі, кааліны (гліназём, сернакіслы алюмінат) завозяцца з Украіны. Асн. прадукцыя (1997): вырабы вытв.-тэхн. прызначэння (дыязапапера, папера чарцёжная, малявальная, абгортачная, стужка клеявая); тавары нар. ўжытку (сшыткі школьныя, агульныя, для малявання, альбомы і блокі для чарчэння і малявання, папера пісчая і туалетная, дзённікі і інш.). *А.А.Саламонаў.*

ДО́БРУШСКІ РАЁН, на У Гомельскай вобл. Утвораны 8.12.1926. Пл. 1,5 тыс. км^2. Нас. 47,9 тыс. чал. (1997), гарадскога 46,6%. Сярэдняя шчыльн. 32 чал. на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. *Добруш*; г.п. *Церахоўка*, 101 сельскі населены пункт. Падзяляецца на 16 сельсаветаў: Баршчоўскі, Васільеўскі, Вуцеўскі, Дзям'янкаўскі, Дубраўскі, Жгунскі, Івакаўскі, Кармянскі, Кругавец-Калінінскі, Крупецкі, Кузьмініцкі, Ленінскі, Насовіцкі, Пераростаўскі, Рассветаўскі, Усоха-Будскі і Церахоўскі пассавет.

Раён размешчаны ў межах *Гомельскага Палесся*. Паверхня нізінная. Пераважаюць выш. 140—160 м, найвыш. пункт 172,9 м (каля в. Леніна). Карысныя выкапні: торф, гліны для грубай керамікі, пясок, сапрапелі. Сярэдняя т-ра студз. -6,9 °С, ліп. 18,9 °С. Ападкаў 572 мм за год. Вегетацыйны перыяд 193 сут. Рэкі Іпуць (з прытокамі Хорапуць і Няцёша), Вуць і Церуха. Возера Равучае. Пашыраны дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя і тарфяна-балотныя глебы. Пад лясамі 20,8% тэр. раёна, пераважаюць хваёвыя і бярозавыя лясы; пад балотамі 3,2% плошчы. На тэр. раёна біял. заказнік *Шабрынскі*.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 83,2 тыс. га, з іх асушана 16,2 тыс. га. На 1.1.1997 калгасаў 15, саўгасаў 4. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу, цукр. буракі і лён. Прадпрыемствы харч., лёгкай (ільновалакно), цэлюлозна-папяровай, буд. матэрыялаў прам-сці; вытв-сць фарфору. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтадарога Гомель—Добруш—Бранск (Расія), чыгунка Гомель—Церахоўка—Бахмач (Украіна). У раёне 1 гімназія, 20 сярэдніх, 3 базавыя і 5 пач., 2 муз. школы, прафес.-тэхн. вучылішча, 28 дашкольных устаноў, 27 клубаў, 37 б-к, 2 бальніцы, 6 амбулаторый, 22 фельч.-ак. пункты. Санаторый-прафілакторый «Сонечны». Помнікі архітэктуры: царква (2-я пал. 19 ст.) у в. Вуць; сядзібны дом (канец 19 ст.) у в. Дзям'янкі, Пакроўская царква (2-я пал. 19 ст.) у в. Карма; Троіцкая царква (сярэдзіна 19 ст.) у в. Крупец; царква (канец 19 ст.) у в. Чырвоны Партызан. На сумежжы Беларусі, Украіны і Расіі (за 7 км ад в. Кругавец-Калініна) манумент Дружбы народаў. Выдаецца газ. «Добрушскі край».

ДО́БРУШСКІ ФАРФО́РАВЫ ЗАВО́Д. Створаны ў 1978 у г. Добруш Гомельскай вобл. Выпускае фарфоравыя вырабы (сервізы, дэкар. блюды, дзіцячыя наборы і інш.), якія аздабляюцца ручной размалёўкай, метадам аэраграфіі, штампа, шаўкаграфіі і дэколямі. Працуе маст. лабараторыя. Сярод вырабаў: дэкар. блюды «Ружы», кававыя сервізы «Верасень», «Алеся», сухарніцы «Пяшчотнасць», «Лета», «Ружы» і інш.

ДО́БРЫ БОР, археалагічная стаянка *нёманскай культуры* каля в. Добры Бор Баранавіцкага р-на. Выяўлены 12 агнішчаў, 5 ям (3 з іх, магчыма, паўзямлянкі).

Знойдзены абломкі ляпных вастрадонных і пласкадонных гаршкоў, крамянёвыя зброя і прылады працы (лістападобныя наканечнікі коп'яў, нажы з гарбатай спінкай і інш.), шліфаваныя каменныя сякеры з адтулінамі. Непадалёку ад вёскі выяўлены сляды мезалітычнага паселішча, стаянкі неаліту і бронзавага веку.

ДО́БРЫНА, возера ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бяроза, за 10 км на ПнУ ад г. Сянно. Пл. 0,46 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. 470 м, найб. глыб. 19,1 м, даўж. берагавой лініі каля 4 км. Пл. вадазбору 2,1 км^2. Схілы катлавіны выш. 2—4 м (на Пн да 13 м), на ПнУ разараныя, на Пн пад хмызняком. Берагі месцамі абразійныя. Дно да глыб. 12 м выслана апясчаненымі адкладамі, глыбей — глеямі. Шыр. паласы падводнай расліннасці да 20 м. У возера ўпадае 6 ручаёў, выцякае ручай у Бярозаўскае возера.

ДО́БРЫНА, возера ў Віцебскім р-не, у бас. р. Зах. Дзвіна, за 10 км на ПдЗ ад Віцебска. Пл. 0,37 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 380 м, найб. глыб. 4,9 м, даўж. берагавой лініі каля 4 км. Пл. вадазбору 15,2 км^2. Схілы катлавіны выш. да 20 м (на Пн і Пд да 5 м), у верхняй ч. разараныя, на У пад хмызняком. Берагі пераважна зліваюцца са схіламі, уздоўж урэзу вады параслі хмызняком, на Пн нізкія, пераўвільготненыя. Мелкаводдзе пясчанае, глыбей — сапрапелі, глеі. Зарастае слаба. У возера ўпадае ручай, на Пн выцякае ручай у Зах. Дзвіну.

ДО́БРЫЧ, Добрыца, рака ў Рагачоўскім і Кармянскім р-нах Гомельскай

вобл., правы прыток р. Сож (бас. Дняпра). Даўж. 36 км. Пл. вадазбору 234 км^2. Пачынаецца за 200 м на З ад в. Рубанае Рагачоўскага р-на. Цячэ па Чачорскай раўніне. Асноўны прыток р. Ржаўка. Даліна трапецападобная. Пойма двухбаковая. Ад вытоку на працягу каля 7 км рэчышча каналізаванае, ніжэй звілістае. На рацэ плаціна і сажалка.

ДО́БЫСНА, рака, гл. *Добасна*.

ДО́БЫШ Фёдар Іванавіч (5.3.1906, в. Коханаў Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 29.11.1980), генерал-палкоўнік

Ф.І.Добыш.

І.М.Догель.

(1962). Скончыў аб'яднаную бел. вайск. школу (1931), Ваен. акадэмію Генштаба (1951). У Чырв. Арміі з 1928. Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Калінінскім, Волхаўскім, Паўн.-Зах., Варонежскім, Сцяпным, 2-м і 1-м Укр. франтах: камандзір бамбардзіровачнага авіяпалка, дывізіі. Удзельнік абароны Ленінграда, вызвалення Украіны, Румыніі, Чэхаславакіі, Берлінскай аперацыі. Да 1972 у Сав. Арміі.

ДО́ГА (Doga) Еўжэніу (Яўген Дзмітрыевіч; н. 1.3.1937, с. Мокра Рыбніцкага р-на, Малдова), малдаўскі кампазітар. Нар. арт. Малдовы (1982), нар. арт. СССР (1987). Скончыў Кішынёўскую кансерваторыю па класах віяланчэлі (1960) і кампазіцыі (1965). У 1957—62 артыст аркестра Малд. радыё і тэлебачання. У 1963—67 выкладаў у Кішынёўскім муз. вучылішчы. Яго творчасць, пераважна песенная, цесна звязана з малд. муз. фальклорам. Сярод твораў: балет «Лучафэрул» (1983); кантаты, сімфоніі, уверцюры, стр. квартэты, 9 харояў на вершы Я.Букава, рамансы, песні, музыка да спектакляў драм. т-ра, тэле- і кінафільмаў (больш за 100), у т.л. «Лаўтары» (1972), «Табар адыходзіць у неба» (1976), «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (1978), «Марыя, Мірабела» (1982). Дзярж. прэмія Малдовы 1980, прэмія Румыніі 1982, Дзярж. прэмія СССР 1984.

ДО́ГЕЛЬ Аляксандр Станіслававіч (27.1.1852, г. Паневяжыс, Літва — 19.11.1922), расійскі гістолаг. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1894). Скончыў Казанскі ун-т (1879). З 1888 праф. Томскага, з 1895 — Пецярбургскага ун-таў. Навук. працы па гісталогіі нерв. сістэмы і органаў пачуццяў. Апісаў 10 тыпаў нерв. клетак у чуллівых нерв. вузлах, 3 тыпы нейронаў (клеткі Догеля) у вегетатыўных нерв. вузлах, вывучаў сінапсы ў аўтаномнай нерв. сістэме. Распрацаваў метад прыжыццёвай афарбоўкі нерв. элементаў. Заснаваў час. «Русский архив анатомии, гистологии и эмбриологии» (1915).

Тв.: Концевые нервные аппараты в коже человека. СПб., 1903; Кровь как основа жизни человека и животных. Пг., 1922; Строение и жизнь клетки. М.; Пг., 1922.

ДО́ГЕЛЬ Валянцін Аляксандравіч (10.3.1882, Казань, Татарстан, Расія — 1.6.1955), савецкі заолаг, заснавальнік навук. школы протазаолагаў і паразітолагаў. Чл.-кар. АН СССР (1939). Сын А.С.*Догеля*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1904). З 1913 праф. у ім. З 1929 ва Усесаюзным НДІ азёрнай і рачной гаспадаркі, з 1944 у Заалагічным ін-це АН СССР. Навук. працы па протазаалогіі, паразіталогіі, эмбрыялогіі, параўнальнай анатоміі беспазваночных. Прапанаваў канцэпцыю полі- і алігамерызацыі гамалагічных органаў у эвалюцыі жывёл (1954). Аўтар падручнікаў «Агульная пратысталогія» (1951) і «Агульная протазаалогія» (1962, разам з Ю.І.Палянскім). Ленінская прэмія 1957.

Тв.: Олигомеризация гомологичных органов как один из главных путей эволюции животных. Л., 1954.

ДО́ГЕЛЬ Іван Міхайлавіч (19.3.1830, маёнтак Залессе, Віцебская вобл. — 29.8.1916), расійскі фармаколаг. Ганаровы чл. Ваен.-мед. акадэміі, Казанскага і Тартускага ун-таў, замежных акадэмій і таварыстваў. Скончыў Медыка-хірург. акадэмію ў Пецярбургу (1854). З 1869 праф. Казанскага ун-та. Навук. працы па праблемах уздзеяння лек. сродкаў на сардэчна-сасудзістую і нерв. сістэмы. Упершыню вызначыў магчымасць рэфлекторнага спынення дзейнасці сэрца шляхам раздражнення слізістай абалонкі носа парай хлараформу.

Тв.: Сравнительная анатомия, физиология и фармакология сердца. Казань, 1895; Основы фармакологии и рецептуры. СПб., 1900.

ДО́ГЕЛЬ Мацей (6.8.1715, былая в. Гембулы Лідскага пав. Віленскага ваяв. — 24.2.1760), педагог, гісторык-архівіст, праваед. Пасля заканчэння піярскай школы ў Шчучыне ўступіў у ордэн піяраў (1730, святар з 1732) і займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. З канца 1740-х г. рэктар піярскага калегіума ў Вільні, заснаваў школу з асобным інтэрнатам для шляхецкай моладзі. У 1748 як пасол Рэчы Паспалітай меў магчымасць працаваць у архівах і б-ках Германіі, Францыі, Галандыі, дзе сабраў шмат гіст. і дыпламат. дакументаў. Запланаваў выданне збору міжнар. трактатаў «Дыпламатычны кодэкс Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага», выйшлі 3 тамы (т. 1, 1758, т. 4, 1764, т. 5, 1759). Нявыдадзеныя матэрыялы захоўваюцца ў Рас. нац. б-цы ў Пецярбургу. Выдаў збор дакументаў «Граніцы Польскага каралеўства і Вял. кн. Літоўскага» (1758) па размежаванні дзярж. граніцы ВКЛ з Польшчай у сярэдзіне 16 ст. Зборнікі Д. як гіст. крыніца не страцілі свайго значэння.

Г.Я.Галенчанка.

ДО́ГЕР-БА́НКА (Dogger Bank), водмель у цэнтр. ч. Паўночнага м. Выцягнута з ПдЗ на ПнУ на 260 км, шыр. 30—60 км, найменшая глыб. 13 м. Раён рыбнага промыслу (пераважна траскі).

ДО́ГІ (ад англ. dog сабака), дагападобныя сабакі, група парод службовых сабак. Выкарыстоўваліся як паляўнічыя, баявыя, вартавыя і ахоўныя, цяпер — як свойскія вартавыя і службовыя сабакі. Радзіма Д. — Тыбет; пашырыліся да Еўропы, Паўн. Афрыкі, Японіі. Ад тыбецкіх Д. узніклі сучасныя пароды — баксёры, бульдогі, мастыфы і інш. Назва «Д.» захавалася за ням., выведзеным у Германіі ў сярэдзіне 19 ст., страж. байцоўскім бардоскім і бе-

Дог нямецкі.

лым паляўнічым аргенцінскім, выведзенымі ў 1920-я г.

Нямецкі Д. — самая вял. сярод інш. парод сабак. Выш. ў карку 72—80 см, маса 70 кг і больш. Канстытуцыя моцная, сухая, касцяк і мускулатура магутныя. Грудзі глыбокія, галава доўгая, з шырокімі масіўнымі сківіцамі, на доўгай шыі. Поўсць кароткая, густая, бліскучая. Масць чорная, мармуровая, палевая, тыгравая, блакітнавата-шэрая розных адценняў. Характэрны алюр — галоп.

Э.Р.Самусенка.

ДО́ГМА (ад грэч. dogma меркаванне, рашэнне, вучэнне), палажэнне, якое прымаецца на веру як бясспрэчная ісціна. Характэрная рыса Д. — сляпая вера ў аўтарытэты, абарона застарэлых, памылковых або недаказаных палажэнняў. У ант. л-ры тэрмін «Д.» абазначаў агульнавядомае палажэнне, якое з'яўлялася бясспрэчнай ісцінай; такую ж назву мелі некат. дзярж. ўказы і пастановы. У стараж.-грэч. філасофіі дагматыкамі называлі філосафаў, якія ў процілегласць скептыкам сцвярджалі што-небудзь станоўчае. Аснову любых рэлігій складаюць *догматы рэлігійныя*, што прымаюцца на веру і абавязковыя для ўсіх. У галіне навукі Д. набываюць нязменныя формы, застарэлыя пала-

жэнні, якія прымаюцца без уліку гіст. умоў, абараняюцца кансерватыўна мыслячымі вучонымі. Дагматычнае мысленне перашкаджае развіццю навукі, скоўвае творчасць.

ДО́ГМАТЫ РЭЛІГІ́ЙНЫЯ, афіцыйна прызнаныя палажэнні рэліг. веравучэння, якія абвяшчаюцца царквой бясспрэчнай ісцінай, не падлягаюць перагляду і зменам, прызнаюцца вечнымі боскімі ўстанаўленнямі, абавязковымі для ўсіх веруючых. Кожная з рэлігій мае сваю дагматычную сістэму. У *хрысціянстве* догматы зацверджаны 2 першымі *ўсяленскімі саборамі* — Нікейскім (325) і Канстанцінопальскім (381) і атрымалі назву Нікея-Царградскага сімвала веры. Яны ўключаюць 12 асн. догматаў: аб адзінстве і траістасці Бога; аб Хрысце як зямным увасабленні Бога, сыне Божым, пасрэдніку паміж Богам і людзьмі; аб другім прышэсці Хрыста на зямлю; аб пашане адзінай саборнай царквы; аб неабходнасці хрышчэння; аб веры ў цялеснае ўваскрэсенне памерлых; аб веры ў замагільнае жыццё пасля *«страшнага суда»* і інш., якія пазней дапаўняліся. Праваслаўная царква абмежавалася рашэннямі першых 7 сусв. сабораў. Пасля падзелу цэркваў заходняя, рымска-каталіцкая, уключыла ў сваё веравучэнне новыя догматы: аб філіёкве (аб зыходжанні Святога духа не толькі ад бога-айца, але і ад сына); аб чысцілішчы; аб запасе добрых спраў; аб бязгрэшным зачацці *Багародзіцы*. *Пратэстантызм* прызнаў Д.р. аб апраўданні сваіх паслядоўнікаў веру, а не царквою. *Іудаізм* у розныя часы прытрымліваўся розных дагматычных сістэм, з іх засталіся асн. тры: прызнанне адзінабожжа Яхве, богавыбраннасці яўр. народа і чаканне прыходу месіі (збавіцеля). *Іслам* у межах яго багаслоўскай сістэмы — калама — выпрацаваў догматы: аб адзіным Богу — *Алаху*, аб яго пасланніку *Мухамеду*, аб прадвызначэнні чалавечага лёсу Алахам. *Індуізм* зыходзіць з прызнання святасці «Ведаў», з перасялення душ, з няроўнасці людзей, наяўнасці *кармы* і інш. (гл. таксама *Догма*).

А.А.Цітавец.

«ДОДЖ» (Dodge), марка легкавых і грузапасажырскіх аўтамабіляў рознага прызначэння. Выпускаюцца аднайм. аддзяленнем амер. канцэрна «Крайслер» з 1914. Мадэлі пераважна пярэднепрывадныя; магутнасць рухавіка 98—294 кВт, найб. скорасць да 266 км/гадз,

Да арт. «Додж». Легкавы аўтамабіль «Додж Крайслер-Неон».

грузападымальнасць 0,5—12 т, аб'ём грузавога адсека 0,22—4,88 м^3.

ДОЖ (італьян. doge ад лац. dux правадыр), кіраўнік Венецыянскай (у канцы 7—18 ст.) і Генуэзскай (у 14—18 ст.) рэспублік. У Венецыі выбіраўся патрыцыятам з свайго асяроддзя пажыццёва і першапачаткова меў вял. ўладу. У 12—14 ст. роля Д. паступова зведзена да намінальнага прадстаўніцтва. У Генуі пажыццёвая пасада Д. ўведзена ў 1339, пасля 1528 тэрмін яе выканання абмежаваны 2 гадамі. Скасавана ў 1797 пасля заняцця паўн. Італіі войскамі ген. Напалеона Банапарта.

ДО́ЖДЖ, від атмасферных ападкаў у выглядзе кропель вады дыяметрам 0,5—7 мм. Утвараецца ў выніку кандэнсацыі вадзяной пары ў паветры і зліцця дробных кропель у больш буйныя або раставання крышталёў, што выпадаюць з воблакаў.

А б л а ж н ы я Д. працяглыя, раўнамерныя інтэнсіўнасці, выпадаюць са слаіста-дажджавых або высокаслаістых воблакаў на вял. плошчы; л і ў н е в ы я Д. кароткачасовыя, маюць хутказменлівую і часта вял. інтэнсіўнасць, выпадаюць з кучава-дажджавых воблакаў (гл. *Лівень*). Д. з дыяметрам кропель менш за 0,5 мм наз. *імжой*. Бывае ледзяны Д. у выглядзе дробных празрыстых ледзяных шарыкаў дыяметрам 1—3 мм, што ўтвараюцца пры замярзанні кропель Д. ў паветры з адмоўнай т-рай, і пераахалоджаны Д., кроплі якога застаюцца вадкімі пры адмоўнай т-ры і замярзаюць у выглядзе *галалёду* на паверхні Зямлі.

На Беларусі выпадзенне Д. часцей звязана з цыкланічнай дзейнасцю. Вадкія ападкі (пераважна Д.) даюць ад 75% на У да 80% на З гадавой сумы ападкаў. За год бывае каля 110 сут з Д. Летам пераважаюць ліўневыя Д., найб. дажджлівы месяц ліпень (13—16 сут з Д.). У халодны перыяд года акрамя снегу выпадаюць аблажныя Д. і імжа (да 8 сут з ападкамі за месяц). Гл. таксама *Ападкі атмасферныя*.

ДО́ЖЫ ДЗЬЁРДЗЯ ПАЎСТА́ННЕ 1514, С я л я н с к а я в а й н а 1514, найбуйнейшае антыфеад. ўзбр. выступленне ў сярэдневяковай Венгрыі. Яго перадумовай быў набор у краіне з крас. 1514 добраахвотнікаў для крыжовага паходу супраць туркаў. Успыхнула ў маі як рэакцыя сялян на спыненне іх прыёму ў крыжацкае войска (прыём у крыжакі азначаў для сялян вызваленне з-пад улады іх паноў). Ахапіла б.ч. дзяржавы, праходзіла пад лозунгамі адмены феад. эксплуатацыі і царк. дзесяціны, падзелу царк. зямель паміж крыжакамі, устанаўлення ўсеагульнай роўнасці, спрашчэння царк. арганізацыі. Удзельнічала да 100 тыс. чал. (пераважна сялян), аднак з-за разрозненасці дзеянняў каля 50 тыс. паўстанцаў былі хутка знішчаны дваранскімі атрадамі. Спыненне ў ліп. 22-тысячным войскам трансільванскага ваяводы Я.Запаяі гал. сіл паўстанцаў на чале з Дзьёрдзем Дожам каля крэпасці Тэмешвар (цяпер Тымішаара, Румынія), калі Дожа трапіў у палон і быў пакараны смерцю, паскорыла паражэнне паўстання. У крас.—ліст. 1514 Дзярж. сход прыняў закон аб пазбаўленні сялян свабоды і навечным прымацаванні іх да зямлі (адменены ў 1530).

Літ.: Г у с а р о в а Т.П. «Я хотел обновить мир» // И живы памятью столетий. Мн., 1987.

ДО́ЗА (ад грэч. dosis порцыя, прыём), вызначаная, дакладна адмераная колькасць чаго-н. (якога-н. рэчыва, лякарства). Гл. таксама *Дозы выпрамянення*.

ДО́ЗЫ ВЫПРАМЯНЕ́ННЯ, колькасныя характарыстыкі ўздзеяння энергіі выпрамянення на рэчыва. Гал. велічынёй, якая характарызуе ўздзеянне выпрамянення на арганізм, з'яўляецца п а г л ы н у т а я д о з а — энергія *іанізавальнага выпрамянення*, паглынутая адзінкай масы апрамененага рэчыва. У сістэме СІ за адзінку паглынутай дозы прыняты *грэй*, пазасістэмная адзінка — *рад*. Пры аднолькавай паглынутай дозе біял. эфект уздзеяння розных відаў апрамянення адрозніваецца, таму карыстаюцца э к в і в а л е н т н а й д о з а й, якая вызначаецца пры памнажэнні паглынутай дозы на каэфіцыент якасці (К) дадзенага выпрамянення. У сістэме СІ адзінка эквівалентнай дозы — *зіверт*, пазасістэмная — *бэр*. Для вымярэння рэнтгенаўскага і гама-выпрамянення служыць э к с п а з і ц ы й н а я д о з а — колькасць утвораных зарадаў пры іанізацыі паветра пад уздзеяннем гэтых выпрамяненняў. У сістэме СІ адзінка вымярэння экспазіцыйнай дозы — *кулон* на кілаграм (Кл/кг), пазасістэмная — *рэнтген*. Прынята параўноўваць біял. эфекты, што выклікаюць любыя іанізавальныя выпрамяненні, з біял. эфектамі, што выклікаюць рэнтгенаўскія і гама-выпрамяненні. У радыебіял. даследаваннях пры параўнанні радыяцыйных эфектаў карыстаюцца *адноснай біялагічнай эфектыўнасцю* выпрамяненняў. Натуральныя крыніцы іанізавальнага выпрамянення (касм. прамяні, прыродная радыеактыўнасць глебы, вады, паветра, радыеактыўнасць, што ёсць у целе чалавека і жывёл і інш.) складаюць каля 125 мбэр за год. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС (1986) у навакольнае асяроддзе выкінута радыеактыўных рэчываў агульнай актыўнасці каля 50 млн. Кі (3,5% агульнай колькасці *радыенуклідаў*). На Беларусі зацверджаны крытэрыі ўзроўню радыяцыйнай забруджанасці (А і Б). Узровень А — доза знешняга гама-апрамянення цела не перавышае 0,25 Гр (няма неабходнасці ў экстранных мерах). Пры ўзроўні Б (да 0,75 Гр) меры залежаць ад канкрэтных абставін. Экстранныя меры для забеспячэння радыяцыйнай аховы прымаюцца ў выпадках дасягнення дозы знешняга апрамянення ўсяго цела больш за 0,75 Гр. Вымяраюць Д.в. дазіметрамі (гл. *Дазіметрычныя прылады*).

ДО́ЙЗІ (Doisy) Эдуард Адэлберт (13.11.1893, г. Хума, штат Ілінойс, ЗША — 23.10.1986), амерыканскі біяхімік. Чл. Нац. АН ЗША (1938). Скончыў

Ілінойскі ун-т (1914). Д-р філасофіі (1920), праф. (1923). У 1914—17 працаваў у Гарвардскай мед. школе, з 1919 у Вашынгтонскім ун-це, у 1923—65 — у мед. школе пры Ун-це ў Сент-Луісе. Навук. працы па вывучэнні структуры вітамінаў і гармонаў. Вылучыў у крышталічнай форме жан. палавыя гармоны эстрон (1929) і эстрадыёл (1936). Адкрыў хім. структуру вітаміну К, ідэнтыфікаваў K_1 і K_2, сінтэзаваў вітамін K_1 (1939). Нобелеўская прэмія 1943 (разам з Г.*Дамам*).

Э.Дойзі.

ДОЙЛ (Doyle) Артур Конан (22.5.1859, г. Эдынбург, Вялікабрытанія — 7.7.1930), англійскі пісьменнік. Скончыў мед. ф-т Эдынбургскага ун-та (1881). Дэбютаваў у 1879 апавяданнем «Тайна даліны Сэсаса». Аўтар прыгодніцкіх («Выгнаннікі», 1893, «Родней Стон», 1896) і навук.-фантаст. («Згублены свет», 1912, «Атручаны пояс», 1913) раманаў і аповесцей, у т.л. «Маракотава бездань» (1929). Сусв. вядомасць прынеслі творы, аб'яднаныя вобразам сышчыка-аматара Шэрлака Холмса: «Знак чатырох» (1890), «Сабака Баскервіляў» (1901—02), «Даліна жаху» (1914—15), зб. апавяданняў «Прыгоды Шэрлака Холмса» (1891—92) і інш. Прадаўжаючы традыцыі Э.По і У.Колінза, развіў дэтэктыўны жанр, у якім спалучаў драматызм і дынаміку апавядання з псіхал. перакананасцю вобразаў. У Лондане створаны мемар. Музей Шэрлака Холмса.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч.: У 12 т. Т. 1—3. М., 1992—94.

Літ.: Карр Дж.Д. Жизнь сэра Артура Конан Дойла: [Пер. с англ.]. М., 1989.

Е.А.Лявонава.

ДОЙЛІДСТВА, гл. ў арт. *Архітэктура*.

ДОЙЧЭ ПРЭСЭАГЕНТУ́Р (Deutsche Presseagentur; ДПА), сусветнае інфармацыйнае агенцтва ў Германіі. Акцыянернае т-ва. Засн. ў 1949 (Гамбург).

ДОК (галанд. dok, англ. dock), 1) збудаванне для агляду і рамонту падводнай часткі суднаў або для іх пабудовы. Бываюць сухія, наліўныя і плывучыя. Звычайна з'яўляюцца часткай *верфі* або суднарамонтнага прадпрыемства. 2) Штучны партовы басейн з затворам, прызначаны для стаянкі суднаў пад пагрузкай-разгрузкай у месцах з вял. прыліўна-адліўнымі ваганнямі ўзроўню мора. 3) Зборна-разборнае збудаванне для тэхн. абслугоўвання вял. лятальных апаратаў (пераважна дырыжабляў).

ДО́КАЗ у логіцы, спосаб абгрунтавання (вызначэння) ісціннасці выказвання, меркавання, тэорыі з дапамогай лагічных вывадаў і практычных сродкаў (назіранне, эксперымент). Д. не стварае ісціннасці выказвання, яна аб'ектыўная і выяўляецца з дапамогай Д. У лагічнай структуры Д. вызначаюць: тэзіс — сцвярджэнне, якое трэба даказаць, аснову (аргументы) — сцвярджэнні, з дапамогай якіх даказваецца тэзіс, ідэманстрацыю — выснову ці ланцуг высноў, з дапамогай якіх тэзіс выводзіцца з аргументаў. Паводле спосабу вядзення Д. падзяляюць на прамыя і ўскосныя, а па форме вывадаў — на дэдуктыўныя і індуктыўныя. У прамым Д. тэзіс лагічна вынікае з асновы, ва ўскосным — даказваецца памылковасць антытэзіса (суджэння, што супярэчыць тэзісу) і па *выключанага трэцяга прынцыпу* тэзіс прымаецца ў якасці ісціннага. Пры Д. тэзіса ці антытэзіса абавязкова трэба прытрымлівацца правіла Д., а каб Д. быў паспяховым, неабходна прытрымлівацца правіл, што прад'яўляюцца да тэзіса і аргументаў. Але не ўсе выказванні падлягаюць Д. Са стараж. часоў Д. быў у цэнтры ўвагі логікаў і філосафаў, ён выкарыстоўваецца ва ўсіх навуках і ў паўсядзённых зносінах людзей.

В.М.Пешкаў.

ДО́КАЗЫ СУДО́ВЫЯ, фактычныя звесткі пра акалічнасці, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння крымінальнай або цывільнай справы. Такія звесткі ёсць у паказаннях сведак, пацярпелага, падазронага, абвінавачанага, у рэчавых доказах, заключэннях экспертаў, пратаколах следчых і суд. дзеянняў. Адрозніваюць Д.с: асабістыя (зыходзяць ад людзей) і рэчавыя; прамыя (устанаўліваюць якую-н. акалічнасць) і ўскосныя (устанаўліваюць толькі прамежкавы факт); тыя, што сцвярджаюць факт або абвяргаюць яго; непасрэдныя і вытворныя. Парадак атрымання Д.с., іх замацавання і прадастаўленне суду вызначаецца працэсуальным заканадаўствам.

Э.І.Кузьмянкова.

ДО́КЕР (англ. docker), партовы грузчык, рабочы дока.

Док плывучы.

«ДОКЛА́ДЫ АКАДЭ́МИИ НАЎК БЕЛАРУ́СИ», навуковы часопіс. Выходзіць з ліп. 1957 на рус. мове (рэзюме і на англ. мове) 6 разоў на год. Змяшчае кароткія паведамленні пра вынікі новых арыгінальных завершаных даследаванняў у галіне матэматыкі, прыродазнаўства і тэхнікі, выкананых у НДІ Нац. АН Беларусі, ВНУ і н.-д. установах рэспублікі.

ДО́КТАР НАВУ́К, вучоная ступень. Упершыню стала прысуджацца ў 1130 Балонскім ун-там, потым у 1231 Парыжскім. У Рас. імперыі ступень Д.н. уведзена ва ун-тах у 1819, надавалася асобам, якія абаранілі доктарскую дысертацыю і мелі ступень магістра. У Беларусі з 1934. Прысуджаецца *Вышэйшым атэстацыйным камітэтам Рэспублікі Беларусь* на падставе хадайніцтваў саветаў па абароне дысертацый асобам, якія, як правіла, маюць вучоную ступень кандыдата навук або вучонае званне прафесара і абаранілі дысертацыю. На 1.1.1997 у Беларусі 2265 Д.н.

ДО́КТАРАЎ Яўген Уладзіміравіч (н. 2.9.1946, г. Вілейка Мінскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1993). Скончыў БДУ (1971). З 1974 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па тэарэт. фізіцы і фізіцы салітонаў. Распрацаваў метады дакладнага інтэгравання нелінейных эвалюцыйных ураўненняў і з іх дапамогай даследаваў дынаміку салітонавых імпульсаў у валаконна-аптычных лініях сувязі.

Тв.: Некоторые геометрические и групповые методы в теории вполне интегрируемых нелинейных уравнений // Теория групп, гравитация и физика элементарных частиц: Тр. Физического ин-та АН СССР. М., 1986. Т. 167.

ДО́КШЫЦКА-КРУЛЁЎШЧЫНСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1943. Праведзена 16—17.8.1943 1-й Антыфаш. партыз. брыгадай ва ўзаемадзеянні з партыз. брыгадай «Жалязняк».

Вечарам 16 жн. партызаны акружылі Докшыцы і ачапілі ўсе ваен. аб'екты гарнізона. У 6 гадз раніцы 17 жн. штурмавыя групы абязброілі і знішчылі 38 і ўзялі ў палон 60 гітлераўцаў. 1-я Антыфаш. брыгада зрабіла пераход да ст. Крулеўшчына. Да вечара 17 жн. Докшыцы і ст. Крулеўшчына былі поўнасцю ачышчаны ад праціўніка. У выніку бою разбураны ўсе станцыйныя збудаванні, узарваны 4 масты, паравознае дэпо, нафтабаза, склад з боепрыпасамі, гараж з аўтамашынамі і інш., на суткі выведзены са строю ўчастак чыгункі Крулеўшчына—Параф'янава. У Крулеўшчыне ў гонар баявой аперацыі партызан пастаўлены помнік.

ДО́КШЫЦКАЯ БАТЛЁЙКА ПАТУ́ПЧЫКА. Вядомы ў пач. 20 ст. ў г. Докшыцы (Віцебская вобл.) і ў навакольлі тып нар. прафесійнага лялечнага т-ра *батлейка*. Канструкцыя батлейкі Патупчыка была зроблена па прынцыпе пашыранага на Віцебшчыне *жлоба*. Уяўляла сабой 2-ярусную скрыню,

знешне ўпрыгожаную, з пераменнымі празрыстымі (іх ставілі перад запаленымі свечкамі) дэкарацыямі, якія размяшчаліся на ўстаўных планках па баках скрыні. Выкарыстоўваліся звычайныя ў батлейцы шпянёвыя лялькі, часам пальчаткавыя. З лялькамі працавалі жонка і сын, сам Патупчык ажыццяўляў усю размоўную частку паказу і суправаджаў яго ігрой на скрыпцы. Паказы адбываліся на Каляды, у час інш. свят, фэстаў, на кірмашах, вяселлях і вечарынках.

ДО́КШЫЦКІ БОЙ 1943. Адбыўся ў лют. 1943 паміж партыз. брыгадай «Жалязняк» і гарнізонам ням.-фаш. захопнікаў у г. Докшыцы.

Перад пачаткам аперацыі партызаны перакрылі засадамі ўсе дарогі на Докшыцы. 1-ы атрад наступаў з ПдЗ, 2-і — з ПдУ, 3-і — з ПнУ, 4-ы прыкрываў наступаўшых. 6 падрыўных груп павінны былі дывэрсіямі на чыгункі адцягнуць шматлікія фаш. гарнізоны, якія размяшчаліся ўздоўж чыг. лініі Маладзечна—Полацк. Наступленне пачалося ў ноч на 3 лютага. Партыз. батарэі нанеслі ўдар па цэнтры горада, дзе размяшчаліся ўстановы акупантаў, і раніцай пакінулі Докшыцы, захапіўшы вял. колькасць маёмасці са складаў працаўніка. 19 і 20 лютага партызаны зноў нанеслі раптоўны ўдар па Докшыцкім гарнізоне. Ворагу прычынены вял. страты ў жывой сіле і тэхніцы. *Р.А.Чарнаглазава.*

ДО́КШЫЦКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў Рас. імперыі ў 1793—97. Утвораны ў складзе Мінскай губ. з частак Ашмянскага і Мінскага пав. ВКЛ пасля іх далучэння да Расіі ў час 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793). Цэнтр — мястэчка (з 1795 горад) *Докшыцы*. Найб. значнымі паселішчамі Д.п. былі мястэчкі Беразіно, Гайна, Даўгінава, Ілья, Лагойск, Плешчаніцы, сёлы Бягомль, Нябышына і інш. Скасаваны ў пач. 1797, яго тэр. падзелена паміж Вілейскім і Барысаўскім пав. Мінскай губ.

В.Л.Насевіч.

ДО́КШЫЦКІ РАЁН, на ПдЗ Віцебскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Пл. 2,2 тыс. км^2. Нас. 36,1 тыс. чал. (1997), гарадскога 29,6%. Сярэдняя шчыльн. 16 чал. на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. *Докшыцы*; г.п. *Бягомль*, 277 сельскіх населеных пунктаў. Падзяляецца на 10 сельсаветаў: Бярозкаўскі, Бярэзінскі, Ваўкалацкі, Докшыцкі, Крулеўшчынскі, Крыпульскі, Параф'янаўскі, Парплішчанскі, Сітцаўскі, Тумілавіцкі.



Большая ч. раёна ў межах *Верхнебярэзінскай нізіны* і *Нарачана-Вілейскай нізіны*, на Пн адгор'і *Свянцянскіх град*, на Пд *Мінскае ўзвышша*. Паверхня ўзгорыста-раўнінная. Пераважаюць выш. 160—200 м, найвыш. пункт 264,4 м (каля в. Лусцічы). Карысныя выкапні: торф, пясчана-жвіровы матэрыял, легкаплаўкія гліны. Сярэдняя т-ра студз. -7,2 °С, ліп. 17,2 °С. Ападкаў 623 мм за год. Вегетацыйны перыяд 183 сут. Рэкі Бярэзіна з Поняй (бас. Дняпра), Вілія і Сэрвач (бас. Нёмана). Найб. азёры Сэрвач, Плаўна, Вольшыца, Медзазол, Межужол, Манец. Пашыраны дзярнова-падзолістыя забалочаныя, дзярнова-падзолістыя і тарфяна-балотныя глебы. Пад лясамі 44% тэр. раёна, пераважаюць хваёвыя і бярозавыя лясы. На тэр. раёна *Бярэзінскі біясферны запаведнік*, гідралагічныя заказнікі рэсп. значэння: Верхневілейскі, Галубіцкая пушча, Сэрвач. Помнік прыроды — дуб (узрост больш за 450 гадоў) у парку в. Сітцы.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 82,7 тыс. га, з іх асушаных 24,7 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 14 калгасаў, 7 саўгасаў, 55 фермерскіх гаспадарак. Асн. галіны сельскай гаспадаркі — ільнаводства і малочна-мясная жывёлагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу. Прадпрыемствы па вытв-сці буд. матэрыялаў, паліўнай (торфабрыкет), харч. (кансервы, кандытарскія вырабы, вытв-сць віна і спірту і інш.), лёгкай прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Полацк—Маладзечна, Крулеўшчына—Глыбокае, аўтадарогі Глыбокае—Докшыцы—Бягомль, Лепель—Бягомль—Плешчаніцы, Ушачы—Докшыцы—Вілейка. У раёне 16 сярэдніх, 12 базавых, 7 пач. школ, 1 вочна-завочная школа, дапаможная школа-інтэрнат, дзіцяча-юнацкая спарт., 2 муз. і дзіцячая школа мастацтваў, 19 дашкольных устаноў, 38 клубаў, 43 б-кі, 8 бальніц, 2 амбулаторыі, 23 фельч.-ак. пункты, санаторый «Лясное» і санаторый-прафілакторый «Баравое». Помнікі архітэктуры: касцёл Іаана Хрысціцеля (канец 19 ст.) у в. Ваўкалаты, царква (18 ст.) у в. Камайск; касцёл Іаана Хрысціцеля (1908) у в. Параф'янава; Спаска-Праабражэнская царква (1627) у в. Порплішча; брама (пач. 18 ст.) і Георгіеўская царква (1913) у в. Сітцы; Юр'еўская царква (1870) у в. Тумілавічы. Выдаецца газ. «Родныя вытокі».

ДО́КШЫЦЫ, горад, цэнтр Докшыцкага р-на Віцебскай вобл., у вярхоўі р. Бярэзіна. За 200 км ад Віцебска, 12 км ад чыг. ст. Параф'янава на лініі Маладзечна—Полацк. Аўтадарогамі злучаны з Вілейкай, Глыбокім, Лепелем, Бягомлем. 7,4 тыс. ж. (1997).

Упершыню ўпамінаюцца ў 1407. Належалі Манівідам, Гальшанскім, Радзівілам, Кішкам і інш. З 1621 мястэчка. З 1793 у Рас. імперыі, цэнтр *Докшыцкага павета*. З 1795 горад. У 1796 Д. атрымалі герб: у зялёным полі 2 узгоркі, на якіх ляжаць збаны, з іх гарлавін цякуць сярэбраныя крыніцы. З 1797 у Барысаўскім пав. У канцы 19 ст. ў Д. больш за 5,6 тыс. ж. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Дзісенскага пав. Віленскага ваяв. З 1939 у БССР, 3,6 тыс. ж. З 15.1.1940 горад, цэнтр *Докшыцкага раёна*. У Вял. Айч. вайну з 9.7.1941 да 2.7.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія ў Д. і раёне загубілі 4931 чал. У Д. размяшчаўся вял. гарнізон ворага, які неаднаразова быў разбіты партызанамі (гл. *Докшыцкі бой 1943, Докшыцка-Крулеўшчынская аперацыя 1943*). 2,2 тыс. ж. (1959). У 1962—65 Д. ў Глыбоцкім раёне.

Прадпрыемствы харч. прам-сці. Помнік архітэктуры — царква (канец 19 — пач. 20 ст.). Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнік Вызвалення.

ДОЛ, 1) даліна вял. памераў, звычайна тэктанічнага паходжання (напр., Тым-Паранайскі Д. на Сахаліне, Кучана-Мешхедскі Д. у Іране). 2) Доўгая лагчына (даліна, яр), якая мае невял. нахіл, спадзістыя схілы, шырокае днішча.

ДО́ЛАР (англ. dollar ад ням. Taler талер), 1) грашовая адзінка ЗША, роўная 100 цэнтам. Уведзены з 1786 паводле рашэння кангрэса ЗША (спачатку сярэбраны, з 1792 і залаты). З 1873 пасля адмены свабоднай чаканкі серабра грашовай адзінкай стаў Д. залаты. З 1928 эмісія Д. ў банкнотах, з 1965 — меднанікелевага Д. У сучаснай валютнай сістэме Д. фактычна прызнаны асновай валютных парытэтаў і курсаў. Д. ЗША з'яўляецца таксама грашовай адзінкай Віргінскіх Астравоў, Гуама, Ліберыі, Мікранезіі, Панамы, Пуэрта-Рыкі, Тайваня, Усх. Самоа, Церкса і Кайкаса. 2) Грашовая адзінка Аўстраліі, Багамскіх Астравоў, Барбадаса, Беліза, Бермудскіх Астравоў, Брунея, Гаяны, Зімбабве, Кайман Астравоў, Канады, Ліберыі, Ліві, Новай Зеландыі, Саламонавых Астравоў, Сінгапура, Сянгана (Ганконга), Трынідада і Табага, Фіджы, Ямайкі, групы краін Карыбскага басейна (усходнекарыбскі Д.). 3) Сярэбраная манета ў Кітаі (1907—49).

ДО́ЛАРАВАЯ ЗО́НА, валютная групоўка дзяржаў Паўн., Цэнтр. і Паўд. Амерыкі, Ціхага акіяна і інш., у якіх долар мае абарачэнне нараўне з нац. валютай, а пры адсутнасці нац. валюты яе замяняе.

ДО́ЛАТА, 1) ручны або станочны дрэваапрацоўчы інструмент (разец) для выдзёўбвання адтулін, гнёздаў, пазоў і інш. Станочныя Д. бываюць полыя, з свердлам унутры (для свідравальна-даўбёжных станкоў), ланцугова-даўбёжныя і інш. 2) Інструмент, які выкарыстоўваецца пры ўдарным і вярчальным свідраванні адтулін (гл. ў арт. *Буравы інструмент*).

Долата буравое шарошкавае.

ДО́ЛБІК Міхаіл Сцяпанавіч (12.2.1920, в. Трашковічы Калужскай вобл., Расія — 18.2.1988), бел. вучоны ў галіне арніталогіі. Д-р біял. н. (1972). Скончыў БДУ (1947). З 1948 у АН Беларусі: з 1955 у Ін-це біялогіі, з 1975 у Ін-це заалогіі. Навук. працы па біял. асновах выкарыстання і аховы птушак, ландшафтнай арніталогіі, зоагеаграфіі і паляўніцтвазнаўстве. Вызначыў склад фауны птушак Палесся і Беларусі. Высветліў размеркаванне прамысл., лясных вераб'іных і птушак культ. ландшафтаў. Распрацаваў зоагеагр. раянаванне тэр. Беларусі на ландшафтнай аснове.

Тв.: Птицы Белорусского Полесья. Мн., 1959; Птицы Белоруссии. Мн., 1967 (разам з А.У.Фядзюшыным); Ландшафтная структура орнитофауны Белоруссии. Мн., 1974; Влияние мелиорации на животный мир Белорусского Полесья. Мн., 1980 (у сааўт.).

ДО́ЛЕВАЯ АДКА́ЗНАСЦЬ, разнастайнасць цывільнай адказнасці пры наяўнасці ў абавязацельстве некалькіх даўжнікоў. Паводле агульнага правіла, замацаванага цывільным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, такое абавязацельства лічыцца долевым, прычым кожны з даўжнікоў абавязаны выканаць яго ў роўнай долі. У законе або ў дагаворы могуць быць устаноўлены інш. суадносіны памераў Д.а. Калі з закону або з дагавора іх не вынікае, дзейнічае прэзумпцыя роўнасці долей пры адказнасці кожнага з садаўжнікоў перад крэдыторам. Гл. таксама *Салідарная адказнасць, Субсідыярная адказнасць.*

ДО́ЛЬНІК, від верша, своеасаблівая пераходная форма ад сілаба-танічнай да танічнай сістэм вершаскладання. У ім выяўляецца чаргаванне моцных націскаў (іктаў) і міжіктавых інтэрвалаў. Колькасць іктаў у радках звычайна ўрэгулявана, міжнаціскныя ж інтэрвалы не аднолькавыя (1, 2 склады), могуць быць пропускі іктаў. Калі колькасць т.зв. адступленняў ад памеру нязначная, Д. набліжаецца да сілаба-танічнага верша, калі іх колькасць павялічваецца — да танічнага. Аналагічныя віды верша існуюць у англ., ням., рус. і інш. паэзіях. У бел. паэзіі Д. карысталіся Цётка, М.Багдановіч, Я.Колас, А.Куляшоў, П.Панчанка, У.Караткевіч і інш.

ДО́ЛЬНІКАЎ Рыгор Усцінавіч (н. 8,5.1923, в. Сахараўка Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1978), ген.-палк. авіяцыі (1981). Засл. ваен. лётчык СССР (1965), канд. гіст. навук. Скончыў Мінскі аэраклуб, Батайскую ваен. авіяц. школу пілотаў (1943), Ваен.-паветр. акадэмію (1955), Вышэйшыя акад. курсы пры Ваен. акадэміі Генштаба (1968). У Чырв. Арміі з 1940. У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1943 на Паўд., 4, 2 і 1-м Укр. франтах. У паветр. баі тараніў варожы самалёт і быў вымушаны скочыць з парашутам, трапіў у палон, прайшоў праз некалькі канцлагераў, уцёк да партызан. У вер. 1943 — крас. 1944 у партыз. атрадзе «За Савецкую Радзіму» Адэскай вобл. З крас. 1944 на фронце, камандзір звяна знішчальнага авіяпалка. Зрабіў 160 вылетаў, правёў 42 баі, Пасля вайны на камандных пасадах. З 1981 нам. галоўнакамандуючага ВПС па ВНУ, нач. ВНУ ВПС. Аўтар кнігі ўспамінаў «Ляціць стальная эскадрылля» (1983).

Р.У.**Дольнікаў**.

ДО́ЛЬНІКІ, катэгорыя сялян ВКЛ у 15—18 ст., галоўнай феад. павіннасцю якой была *доля*. Акрамя гэтага, Д. выконвалі інш. павіннасці: хадзілі на талаку да 12 дзён улетку, будавалі і рамантавалі панскія пабудовы, масты, выконвалі *стацыю*, падводную павіннасць, баброўшчыну (плацяжы футрам або грашыма за карыстанне ўгоддзямі). У 16—18 ст. найб. пашыраны ў Бел. Падзвінні. З развіццём таварна-грашовых адносін і ростам сувязей сельскай гаспадаркі з унутраным і знешнім рынкамі Д. паступова ператвараліся ў паншчынных або чыншавых сялян.

М.Ф.Спірыдонаў.

ДО́ЛЬНЫЯ АДЗІ́НКІ, складаюць вызначаную частку (долю) ад устаноўленай *адзінкі фізічнай велічыні*. У Міжнар. сістэме адзінак (СІ) уведзены наступныя прыстаўкі для ўтварэння найменняў Д.а. (гл. табл.).

Напр., 10^{-3} м = 1 мм (мідіметр), 10^{-6} Дж = 1 мкДж (мікраджоўль), 10^{-12} с = 1 пс (пікасекунда), 10^{-18}Кл = 1 аКл (атакулон). Гл. таксама *Кратныя адзінкі.*

Таблiца

Дольнасць	Прыстаўка	Абазначэнне	
		бел.	міжнар.
10^{-1}	дэцы	д	d
10^{-2}	сатны	с	c
10^{-3}	мілі	м	m
10^{-6}	мікра	мк	μ
10^{-9}	нана	н	n
10^{-12}	піка	п	p
10^{-15}	фемта	ф	f
10^{-18}	ата	а	a

ДО́ЛЬСКІЯ, княжацкі род у ВКЛ уласнага герба (зменены «Касцеша»). Верагодна, паходзілі ад турава-пінскіх Рурыкавічаў. Вядомы з канца 15 ст. Прозвішча ад в. Дольск (Стары Дольск, Пінскі пав., цяпер Валынская вобл. Украіны). Гал. галіна роду мела маёнткі ў Пінскім пав., згасла ў канцы 17 ст.; на Украіне пабочныя адгалінаванні Д., страціўшы княжацкі тытул, існавалі да 19 ст. Найб. вядомыя: Міхаіл Ніцыфар (?—1623), стольнік, падсудак земскі, паборца (1589), суддзя земскі (1606), пінскі, кашталян брэсцкі (1621), маршалак Трыбунала ВКЛ (1611); Ян Кароль (1637—29.4.1695), падстолі слонімскі (1656), маршалак пінскі (1666), маршалак вялікі (1691). У 1690 Ян Кароль атрымаў ад урада зямлю пад Пінскам, дзе збудаваў прадмесце Каралін (названа ў яго гонар) з *Пінскім Каралінскім замкам* і *Пінскім касцёлам Карла Барамея*; заснаваў *Любяшоўскі піярскі калегіум* і Дубровіцкі піярскі калегіум (Валынь).

В.С.Пазднякоў.

ДО́ЛЬФУС (Dollfuß) Энгельберт (4.10.1892, Тэксінг, Аўстрыя — 25.7.1934), аўстрыйскі паліт. і дзярж. дзеяч. Член Хрысц.-сац. партыі. У 1932—34 федэральны канцлер і міністр замежных спраў Аўстрыі. Урад Д. ва ўмовах паліт. і эканам. нестабільнасці ў краіне ўстанавіў аўтарытарнае праўленне (у 1933 распушчаны парламент і с.-д. «*Шуцбунд*», адменены свабода друку і сходаў, забаронена камуніст. партыя; у 1934 ліквідавана паўстанне сацыял-дэмакратаў, забаронены ўсе партыі), у знешняй палітыцы арыентаваўся на фаш. Італію, перад пагрозай *аншлюсу* з боку нацысцкай Германіі ў 1934 заключыў саюз з Італіяй і Венгрыяй. Забіты ў час путчу аўстр. нацыстаў.

ДО́ЛЯ, у славянскай міфалогіі ўвасабленне шчасця, удачы, якія дорыць людзям Бог. Побач з добрай Д. існуюць злая, няшчасная, ліхая Д. і *злыдні*, спадарожнікі дрэннай Д. ці нядолі. Вобраз Д. вельмі пашыраны ў бел. нар. паэт. творчасці.

ДО́ЛЯ, 1) падатак з сялян ВКЛ у 15—18 ст. на карысць землеўладальніка, які забіраў чацвёртую частку (долю) ураджаю. У 16—18 ст. пашырана на Бел. Падзвінні. Выконвалі гэту павіннасць сяляне — *дольнікі*. У канцы 18 ст. Д. заменена чыншам або паншчынай. 2) Руская мера вагі да ўвядзення метрычнай сістэмы мер. Д. = $^1/_{96}$ залатніка = 0,0444 г.

ДОМ АДПАЧЫ́НКУ, прафілактычная аздараўленчая ўстанова для адпачынку і аднаўлення сіл людзей у найб. спрыяльных і здаровых умовах. Д.а. ствараюць прафес. саюзы, мін-вы, ведамствы, асобныя прадпрыемствы і калгасы.

Бываюць Д.а. круглагадовыя, сезонныя і спец. (для бацькоў з дзецьмі, моладзі, цяжарных і інш.), з 12- і 24-дзённым адпачынкам і для адпачынку ў выхадныя дні. Усе Д.а. маюць мед. пункты, на якіх працуюць мед. сёстры, у значных (350 і больш месцаў) ёсць урач, у невялікіх (200—350 месцаў) — фельчар. Некаторыя Д.а. маюць зубаўрачэбны і фізіяпрацэдурны кабінеты, лячэбны масаж. Першыя Д.а. на Беларусі (з 1920): «Жданові-

чы» (з 1970 санаторый) пад Мінскам, «Чонкі» пад Гомелем. У 1980 на Беларусі было 16 Д.а. на 5452 месцы, у 1996 — 11 на 2549 месцаў: 5 з іх ведамасныя, 6 Д.а. («Алеся», «Лагойскі», «Лясныя азёры», «Нарач», «Пухавічы», «Свіцязь») належаць аб'яднанню «Белпрафсаюзкурорт». У 1960-я г. з'явіліся ўстановы на ўзор Д.а. — пансіянаты адпачынку (у 1995 — 4 на 784 месцы) і пансіянаты з лячэннем (1 на 178 месцаў). *Э.А.Вальчук.*

ДОМ АФІЦЭ́РАЎ у Мінску. Пабудаваны ў 1934—39 (перабудова сабора б. архірэйскага падвор'я; арх. І.Лангбард). Для яго архітэктуры характэрны лаканізм і прастата кампазіцыйнай пабудовы. Гал. фасад арыентаваны на цэнтр. сквер. Трохчвэртныя калоны на вышыню 4 паверхаў падтрымліваюць велічны атык. У афармленні інтэр'ераў выкарыстаны сродкі манум.-дэкар. мастацтва (барэльефы на партале сцэны, асвятляльных галерэях, у фае, плавальным басейне; скульпт. А.Бембель, А.Глебаў і інш.). У 1974 рэканструяваны інтэр'еры тэатральнай часткі (аўтарскі калектыў пад кіраўніцтвам арх. Г.Сысоева). *А.А.Воінаў.*

Дом афіцэраў у Мінску.

ДОМ ДЗІЦЯ́ЦІ, рэабілітацыйна-выхаваўчая ўстанова для дзяцей да 3 гадоў: сірот, дзяцей з дэфектамі разумовага і фіз. развіцця. У спецыялізаваных Д.дз. выхоўваюцца дзеці з частковым пашкоджаннем ц.н.с. да 4 гадоў; ёсць групы дзяцей з недахопамі ў разумовым і фіз. развіцці. Выпісваюць дзяцей з Д.дз., калі яны вяртаюцца ў сям'ю, пры ўсынаўленні ці афармленні апекі, пераводзе ў *дзіцячы дом*, дом-інтэрнат сац. забеспячэння.

Найб. пашыраны Д.дз. на 60—80 месцаў. Узначальвае іх гал. ўрач; урач-педыятр і кругласутачны пост мед. сясцёр прызначаецца на 40, лагапед — на 6—10 дзяцей. У вял. і спецыялізаваных Д.дз. ёсць урачы-неўрапатолагі, псіхіятры. З дзецьмі працуюць выхавальніцы і метадысты-псіхолагі. У групе да 3 гадоў 6—8, у групе 3—4-гадовых 8—10 дзяцей. У 1980 на Беларусі было 18 Д.дз. на 1780 месцаў, у 1995 — 13 на 1095 месцаў. *Э.А.Вальчук.*

ДОМ ЛІТАРА́ТАРА ў Мінску, творчы клуб пісьменнікаў Беларусі. Пабудаваны ў 1976 (арх. Ю.Грыгор'еў, В.Шубіна).

Асіметрычны складанай канфігурацыі плана будынак. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя заснавана на кантрасце глухіх паверхняў сцен (крывалінейныя ў плане), абліцаваных светлым туфам, з вузкімі верт. праёмамі, упрыгожанымі вітражамі (маст. У.Стальмашонак). Унутр. планіроўка дакладна размежавана на 2 функцыян. зоны: парадная ўключае на 1-м паверсе вестыбюльную групу памяшканняў, бар, холы, на 2-м — прасторнае фае, глядзельную залу на 336 месцаў, канферэнц-залу, кафэ, кулуары; дзелавая — рабочыя пакоі, кабінеты, б-ку, групу дапаможных памяшканняў. Шэраг асн. і службовых памяшканняў выходзіць ва ўнутр. дворык. У аздабленні інтэр'ераў выкарыстаны прыродны камень, дрэва, чаканка (мастак Ю.Любімаў). *А.А.Воінаў.*

ДОМ МАДЭ́ЛЕЙ у Мінску, установа для распрацоўкі мадэлей адзення, абутку, галаўных убораў. Адкрыты ў 1948. Ажыццяўляе мадэліраванне і канструяванне швейных вырабаў для швейных прадпрыемстваў лёгкай прам-сці Беларусі, забяспечвае іх тэхн. дакументацыяй, прапагандуе новыя мадэлі і фасоны. Апрача стварэння прамысл. калекцыі адзення праводзіць метадычную работу, распрацоўвае перспектыўныя, выставачныя мадэлі. Неаднаразова дэманстраваў дасягненні бел. моды на міжнар. выстаўках, кірмашах і канграсах, у т.л. ў Балгарыі, Індыі, Канадзе, Францыі, Японіі і інш.

Дом літаратара ў Мінску.

ДОМ ПРАЭ́КТНЫХ АРГАНІЗА́ЦЫЙ. Пабудаваны ў 1978 (арх. В.Малышаў) у Мінску для ін-та Белдзяржпраект і інш. праектных арг-цый. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя будынка заснавана на перакрыжаванні пад прамым вуглом асн. 7-павярховага (часткова пастаўлены на жалезабетонныя рамы) і 2-павярховага прамавугольнага ў плане аб'ёмаў. Строгі рытм фасадаў, утвораны панэлямі ў выглядзе кесонаў, узмацняе буйнамаштабную кампазіцыю збудавання. *А.А.Воінаў.*

ДОМ ПРАФЕСІЯНА́ЛЬНЫХ САЮ́ЗАЎ у Мінску. Пабудаваны ў 1982 (арх. Г.Бенядзіктаў, А.Фрыдман). Складаецца з 12- і 16-павярховых аблакіраваных аб'ёмаў і прамавугольнага ў плане аб'ёму канферэнц-залы, размешчаных на 2-павярховым стылабаце складанай канфігурацыі. Кампазіцыя вышыннага корпуса заснавана на спалучэнні злучаных аб'ёмаў, вырашаных у выглядзе пласцін. Лаканічны аб'ём канферэнц-залы падкрэслівае гал. ўваход у будынак. Фасады аздоблены верт. алюмініевымі цягамі, ружовай шклокерамічнай і шэрай пліткай з натуральнага каменю, інтэр'ер — гранітнымі і мармуровымі плітамі.

ДОМ РАБО́ТНІКАЎ МАСТА́ЦТВАЎ рэспубліканскі, творчы клуб дзеячаў мастацтва Беларусі. Адкрыты ў Мінску ў 1963. Мае на мэце прапагандаваць тэатр. і муз. мастацтва, садзейнічаць павышэнню прафес. ўзроўню працаўнікоў мастацтва. Арганізоўвае лекцыі і даклады, творчыя вечары, сустрэчы з майстрамі сцэны. Працуюць ун-т тэатр. мастацтва, клубы творчай і навук. моладзі, «У свеце цудоўнага» (для школьнікаў). Размешчаны ў будынку б. *Мінскага царкоўна-археалагічнага музея.* Мае глядзельную (169 месцаў) і выставачную залы, бібліятэку.

ДОМ РАМЕ́СНІКА, тып жылога дома.

Буд-ва Д.р. пашырылася з 2-й пал. 12 ст. ў Еўропе з ростам рамяства і гандлю. У Беларусі вядомы з сярэдневякоўя да пач. 20 ст. Складаўся з жылой (звычайна размяшчалася з боку двара) і службовай (арыентавана на вуліцу) частак, падзеленых капітальнай сцяной, меў ад 3 да 6 пакояў, будаваўся пераважна з дрэва. З 2-й пал. 18 ст. пашырыліся Д.р. мяшанай канструкцыі: зруб спалучаўся з мураванай сцяной фасада (гл. *Нясвіжскі «дом на рынку»*). Арх.-маст. афармленне канцэнтравалася на гал. фасадзе (драўляныя будынкі аздаблялі дэкар. разьбой, мураваныя мелі элементы стыляў барока і класіцызму). Д.р. групаваліся вакол гандлёвых плошчаў ці на прылеглых да іх вуліцах.

ДОМ САНІТА́РНАЙ АСВЕ́ТЫ, гл. ў арт. *Цэнтр здароўя.*

ДОМ УРА́ДА РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ. Пабудаваны ў 1930—34 (арх. І.Лангбард) у Мінску. Самае буйное ў Беларусі збудаванне грамадзянскай архітэктуры даваен. часу (аб'ём будынка 240 тыс. м^3). Яго стварэнне было пачаткам рэканструкцыі сталіцы.

Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя пабудавана на сіметрычных рознавышынных аб'ёмах,

што надае сілуэту будынка дынамічнасць. 9-павярховая цэнтр. ч. адсунута ў глыбіню і фланкіравана бакавымі крыламі, якія ўтвараюць плошчу 100 × 50 м. Увесь складаны комплекс атрымаў зручную функцыян. арганізацыю ўнутр. прасторы, падпарадкаваную строгай канструкцыйнай сістэме. Інтэр'ер афармлены размалёўкамі і шматфігурнымі рэльефамі. Дом урада — адзін з першых і найб. значных прыкладаў сінтэзу архітэктуры і манум. мастацтва.

Літ.: Воинов А.А., Самбук С.Ф. Дом правительства Белорусской ССР. Мн., 1975.

А.А.Воінаў.

ДОМАБУДАЎНІ́ЧЫ КАМБІНА́Т (ДБК), будаўніча-мантажная арг-цыя, якая вырабляе зборныя жалезабетонныя канструкцыі жылых дамоў, транспартуе іх на буд. пляцоўкі, манціруе з іх будынкі і здае заказчыку цалкам гатовымі да эксплуатацыі. Структура кіравання ДБК залежыць ад яго магутнасці, умоў дзейнасці і да т.п. У арг-цыі такога тыпу рэалізуецца гал. перавага — магчымасць увязвання ў адзіны тэхнал. працэс дзейнасці ўсіх спецыялізаваных падраздзяленняў, таму ў шэрагу ДБК няма буд.-мантажных управленняў. Асн. вытв. падраздзяленні — пастаянна дзеючыя ўчасткі, якія выконваюць буд., сан.-тэхн., электрамантажныя і інш. віды работ.

Аснову базы індустр. домабудаўніцтва Рэспублікі Беларусь складаюць 28 з-даў буйнапанэльнага домабудаўніцтва з агульнай магутнасцю 3198,3 тыс. м^2 агульнай плошчы жылля за год, або 2430,6 тыс. м^3 зборнага жалезабетону (1996). Першы ДБК у краіне створаны ў Мінску ў 1960. Камбінаты падпарадкоўваюцца Мін-ву архітэктуры і буд-ва Рэспублікі Беларусь. Гл. таксама *Аб'ёмнаблочнае домабудаванне.*

М.В.Дэвіер.

ДО́МАГК (Domagk) Герхард (30.10.1895, Лагаў, каля г. Штэрнберг, Германія — 24.4.1964), нямецкі патолаг і мікрабіёлаг. Скончыў Кільскі ун-т (1921) і працаваў у ім. З 1924 у Ін-це паталогіі ў Грайфсвальдзе, з 1925 у Мюнстэрскім ун-це (з 1928 праф.). Адначасова з 1927 дырэктар лабараторыі канцэрна «І.Г.Фарбэніндустры» у г. Вуперталь. Навук. працы па хіміятэрапіі бактэрыяльных інфекцый. Распрацаваў першы эфектыўны прэпарат для лячэння ганарэі (1934), новыя прэпараты для хіміятэрапіі туберкулёзу і пухлін. Абгрунтаваў антыбактэрыяльнае ўздзеянне і ўвёў у лячэбную практыку сульфаніламідныя прэпараты. Нобелеўская прэмія 1939.

Г.Домагк.

ДО́МАРКАС (Domarkas) Юозас (н. 28.7.1936, в. Варкаляй Плунгескага р-на, Літва), літоўскі дырыжор. Нар. арт. Літвы (1974), нар. арт. СССР (1986). Скончыў Вільнюскую (1960, клас кларнета) і Ленінградскую (1960, клас І.*Мусіна*) кансерваторыі. З 1964 гал. дырыжор сімф. аркестра Літ. філармоніі. З 1965 выкладае ў Літ. кансерваторыі. У рэпертуары творы І.С.Баха, Л.Бетховена, Г.Ф.Гендэля, К.Орфа, Г.Малера, Б.Бартака, Б.Брытэна, П.Хіндэміта, К.Дэбюсі, Б.Марціну і інш. Першы выканаўца многіх сімф. твораў літ. кампазітараў. Дзярж. прэмія Літвы 1974.

ДОМАЎЛАДА́ННЕ, сукупнасць прыналежных грамадзяніну на праве прыватнай уласнасці жылога дома (катэджа, дачы, садовага дома і інш.), надворных будынкаў (гаража, хлява, цягліц і інш.), размешчаных на зямельным участку, што знаходзіцца ў дадзенай асобы на

Дом работнікаў мастацтва.

Дом урада Рэспублікі Беларусь.

падставе права ўласнасці або на інш. законнай падставе.

ДО́МБАЛЬ Тамаш Францавіч (29.12.1890, в. Собаў Жэшаўскага ваяв., Польшча — 4.12.1938), бел. эканаміст, дзеяч міжнар. сялянскага руху. Акад. АН БССР (1933), д-р эканам. н. (1934), праф. (1932). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію (1927), Ін-т чырв. праф-

Т.Ф.Домбаль.

суры (1932). З 1919 дэпутат польскага сейма. У 1921 арыштаваны і засуджаны на 6 гадоў катаргі. У 1923 вызвалены ў выніку абмену палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. Ініцыятар склікання 1-й Міжнар. сялянскай канферэнцыі ў Маскве (1923), нам. ген. сакратара Выканкома Сялянскага Інтэрнацыянала. Працаваў у Выканкоме Камінтэрна, Міжнар. арг-цыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі, заснаваў н.-д. Міжнар. аграрны ін-т (1926). У 1932—35 віцэ-прэзідэнт АН БССР і дырэктар Ін-та эканомікі АН БССР. Чл. ЦК КП(б)Б у 1932—37, чл. ЦВК БССР у 1935—37. Аўтар прац па міжнар. сял. руху. 29.12.1936 арыштаваны, прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956.

ДО́МБСКІ (Dąbski) Ян (4.4.1880, с. Кукізава Львоўскай вобл., Украіна — 5.6.1931), польскі паліт. дзеяч, журналіст. У 1-ю сусв. вайну ў польскіх легіёнах. У 1919—30 пасол польскага сейма. У 1920—21 нам. міністра замежных спраў Польшчы, старшыня польскай дэлегацыі на мірных рус.-ўкр.-польскіх перагаворах у Мінску і Рызе. 18.3.1921 падпісаў з польскага боку *Рыжскі мірны дагавор 1921*, паводле якога Зах. Беларусь адыходзіла да Польшчы. Адзін з лідэраў Польскай нар. партыі «*Вызволенне*». Аўтар успамінаў. *У.М.Міхнюк.*

ДО́МЕННАЯ ПЕЧ, домна, шахтавая печ для выплаўкі *чыгуну* з жалезарудных матэрыялаў (афлюсаванага агламерату, акатышаў, жал. руды). Характарызуецца карысным аб'ёмам (бывае да 5000 м^3 і больш) і прадукцыйнасцю (да 12 000 т/сут і больш). Працягласць бесперапыннага дзеяння ад пуску да спынення на капітальны рамонт (т.зв. кампанія) 10—15, часам 20 і больш гадоў.

Зверху праз калашнік у печ загружаюць порцыямі (калошамі) плавільную сыравіну (*шыхту*), знізу праз фурмы ў горне падаюць нагрэтае і абагачанае кіслародам паветра, вадкае, газа- або пылападобнае паліва. У шахце з жалезарудная часткі шыхты адбываецца ўзнаўленне жалеза з вокіслаў і насычэнне яго вугляродам, у выніку чаго ўтвараецца чыгун (гл. *Доменны працэс*). У распары (самая шырокая цыліндрычная ч. печы) і заплечыках (конусная ч.) чыгун і шлак плавяцца (пераходзяць у вадкі стан) і праз спец. адтуліны (ляткі) перыядычна выпускаюцца ў каўшы. Доменны газ, які ўтвараецца ў доменным працэсе, выходзіць з Д.п. праз газаадводы; шлак гранулюецца (выкарыстоўваецца ў буд-ве). Д.п. футэруюць вогнетрывалай муроўкай: верхнюю ч. выкладваюць малагліназёмістым, ніжнюю — высокагліназемістым шамотам; ч. горна, дзе назапашваецца чыгун, і под — вугляродзістымі блокамі. Звонку печ адзяецца ў стальны кажух, які ахалоджваецца пераважна праточнай вадой. Д.п. абсталёўваецца скіпавымі пад'ёмнікамі з ваганеткамі або канвеерамі, сродкамі механізацыі і аўтаматызацыі вытв. працэсу. Непадалёку ад Д.п. звычайна размяшчаецца агламерацыйная ф-ка (гл. *Агламерацыя*). Д.п. з'явіліся ў Еўропе ў сярэдзіне 14 ст., у Расіі каля 1630.

ДО́МЕННЫ ПРАЦЭ́С, выплаўка ў *доменнай печы* чыгуну з жалезарудных матэрыялаў.

У працэсе плаўкі зыходная сумесь — *шыхта* (жал. руда, *агламерат* або *акатышы*, *флюсы* і паліва — *кокс*) рухаецца зверху ўніз насустрач гарачым газам, што ўтвараюцца ў горне печы. Пры ўзаемадзеянні гэтых патокаў аксіды жалеза, якія ёсць у рудзе, узнаўляюцца вугляродам і аксідам вугляроду, што ўтвараюцца пры гарэнні коксу. Атрыманае жалеза пры ўзаемадзеянні з коксам насычаецца вугляродам, у выніку атрымліваецца *чыгун* (сцякае ў горан печы). Расплаўленая пустая парода руды, попел коксу і флюсы ўтвараюць шлак, што ўсплывае над вадкім чыгуном. Праз асобныя ляткі чыгун і шлак перыядычна выпускаюцца. Атрыманы доменны чыгун бывае ліцейны (адрозніваецца высокай цякучасцю, выкарыстоўваецца ў вытв-сці коўкага, высокатрывалага і шэрага чыгуну, для вырабу фасонных дэталей), перароблены (перарабляецца ў сталь, бывае мартэнаўскі, тамасаўскі, бесемераўскі) і спецыяльны. Доменны газ, які ўтвараецца ў Д.п., — пераважна прадукт няпоўнага згарання вугляроду; служыць палівам у паветрана-



Доменная печ: 1 — чыгунны ляток; 2 — паветраная фурма; 3 — горан; 4 — шахта; 5 — скіп; 6 — шыхта; 7 — засыпное прыстасаванне; 8 — комін; 9 — паветрападагравальнік; 10 — газаачышчальнікі; 11 — шлакавы ляток.

гравальніках, коксавых і мартэнаўскіх печах і інш.

ДО́МЖАРЫЦКАЕ БАЛО́ТА, на ПдЗ Лепельскага р-на Віцебскай вобл., у вадазборы р. Бярэзіна. Вярховага, нізіннага, пераходнага і мяшанага тыпаў. Асобныя ўрочышчы на балоце маюць назвы Вокны, Глухая Быкаўка, Жылая Быкаўка, Святая Лука, Доўгі Востраў, Казіны Пераскок, Конскае, Паўлава, Шэры Востраў і інш. Пл. 10,9 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 9,4 тыс. га. Глыб. торфу да 6,9 м, сярэдняя 2,4 м. Балота ў натуральным стане, з'яўляецца ч. *Бярэзінскага біясфернага запаведніка*. Занята лесам з хвоі і бярозы. На Пл пераважаюць асокі і сфагнавыя імхі. Трапляюцца пясчаныя грады з ялавашыракалістым лесам.

ДО́МЖАРЫЦКАЕ ВО́ЗЕРА, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Сергуч, за 26 км на ПдЗ ад г. Лепель, на тэр. *Бярэзінскага біясфернага запаведніка*. Пл. 2,29 км^2, даўж. 2 км, найб. шыр. 1,3 км, найб. глыб. 2,2 м, даўж. берагавой лініі больш за 6 км. Пл. вадазбору 30,5 км^2. Схілы катлавіны нізкія, параслі лесам і хмызняком. На У вял. заліў. Берагі нізкія, забалочаныя, у паўд. ч. тарфяністыя, пад хмызняком. Дно плоскае, каля берагоў выслана торфам, месцамі пяском, у цэнтр. ч. сапрапелем. Вада вызначаецца нізкай празрыстасцю, змяшчае вял. колькасць арган. рэчыва. Зарастае. На Пн выцякае ручай у р. Сергуч.

ДО́МЖАРЫЦЫ, вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., на правым беразе р. Сергуч. Цэнтр сельсавета і адм.-гасп. і навук. цэнтр *Бярэзінскага біясфернага запаведніка*. За 35 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Лепель, 150 км ад Віцебска. 445 ж., 172 двары (1997). Экалагічны ліцэй, муз. школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Музей прыроды Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Каля вёскі 2 курганныя могільнікі 11 ст.

ДОМ-КАМУ́НА, тып жылога дома, які ўключаў жылыя, грамадска-гасп. памяшканні і ўстановы камунальна-быт. абслугоўвання. Першы Д.-к. ў Расіі пабудаваны ў 1904 у Пецярбургу. У 1920—30-я г. будаваліся ў Маскве і інш. гарадах. На Беларусі ў канцы 1920 — пач. 30-х г. пабудаваны *Віцебскі дом-камуна*, *Гомельскі дом-камуна*, дом камунальнага тыпу ў Бабруйску.

4-, 6-павярховыя дамы са складанай канфігурацыяй плана мелі галерэйную і калідорную планіроўку. На першых паверхах размяшчаліся грамадскія памяшканні (залы, холы, бібліятэка-чытальня, сталовая, дзіцячая ўстанова), у цокальным — камунальна-бытавыя, на 2—6-м — жылыя пакоі, агульныя кухні, санвузлы. *А.А.Воінаў.*

ДОМ-КРЭ́ПАСЦЬ, тып жылога дома. Кампазіцыя Д.-к. складалася пад уплывам архітэктуры *замкаў*. На Беларусі вядомы з 17 ст. Звычайна кампактная пабудова з 4 абарончымі вежамі па вуглах (гл. *Гайцюнішскі дом-крэпасць*). У 18—19 ст. пад уплывам архітэктуры Д.-к.

будавалі сядзібныя дамы з *алькежамі*, якія нагадвалі абарончыя вежы (Гродна, Іўе, Копысь, Поразава). *С.А.Сергачоў.*

ДОМ-МУЗЕ́Й І З'ЕЗДА РСДРП. Адкрыты ў 1923 у Мінску ў доме, дзе ў 1898 адбыўся *Першы з'езд РСДРП.* У першыя дні Вял. Айч. вайны дом згарэў. У 1948 адноўлены. У 1953 перамешчаны бліжэй да р. Свіслач. У залах музея 292 экспанаты (1997), у т.л. дакументы і матэрыялы пра ўзнікненне і дзейнасць першых с.-д. груп у Расіі, жандарскія і паліцэйскія данясенні пра I з'езд РСДРП, фотаздымкі дэлегатаў з'езда і матэрыялы пра іх далейшы лёс, «Маніфест Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі» (выд. ў 1898 у Бабруйску) і інш. У мемар. пакоях адноўлена абсталяванне кватэры чыг. служачага мінскага сацыял-дэмакрата П.В.Румянцава. З 1992 філіял Нац. музея гісторыі і культуры Беларусі.
С.М.Сіманюкоў.

ДО́МНА, тое, што *доменная печ.*

ДО́МРА, старажытнарускі нар. струнны шчыпковы муз. інструмент. Найб. пашырана ў 16—17 ст. Мела грыф, авальны корпус. Як сольны і ансамблевы інструмент выкарыстоўвалася скамарохамі, якія стварылі сям'ю Д. (домрышка, Д. Д. басістая). У 2-й пал. 18 ст. паступова знікла. У сучасным выглядзе рэканструявана В.*Андрэевым* (1896). Мае паўсферычны корпус, кароткую шыйку з грыфам, на якім прарэзаны метал. лады, галоўку з калкамі, 3 метал. струны. Гук здабываецца плектрам. На аснове метад Д. ў 1896—98 С.Налімаў стварыў сям'ю аркестравых Д., якая стала асновай *Велікарускага аркестра* імя Андрэева. У 1908 Р.Любімаў і С.Бураў стварылі 4-струнную Д. Абедзве разнавіднасці выкарыстоўваюцца ў аркестрах рус. нар. інструментаў. На Беларусі прафес. і самадз. музіцыраванне на Д. (сольнае, ан-

Домра, рэканструяваная В.І Налімавым.

самблевае, аркестравае) развіваецца пераважна ў гар. асяроддзі. Секстэт Д. выконваў на Бел. тэлебачанні і радыё. Класы Д. ёсць у муз. навуч. установах Беларусі.

ДОН, рака ў еўрап. ч. Расіі. Даўж. 1870 км. Пл. бас. 422 тыс. км^2. Пачынаецца ў усх. схілах Сярэдня-Рускага ўзв. на выш. 190 м. Упадае ў Таганрогскі зал. Азоўскага м., утварае дэльту (пл. да 340 км^2). Верхняе цячэнне ўздоўж стромкага ўсх. краю Сярэдня-Рускага ўзв., даліна вузкая, рэчышча звілістае, сярэдняе і ніжняе цячэнні ў шырокай даліне з шырокай поймай. Малы нахіл у нізоўі абумоўлівае вельмі павольнае цячэнне. Асн. прытокі: Хапёр, Мядзведзіца, Сал, Маныч (злева), Северскі Данец (справа). Жыўленне пераважна снегавое. Ледастаў у вярхоўі з ліст. да крас., у нізоўі — з пач. снеж. да канца сакавіка. Сярэднегадавы расход вады ў ніжнім цячэнні 935 м^3/с. Рыбалоўства. Асн. прамысл. рыбы: судак, лешч, сазан, чахонь, данецкі селядзец, асетр, сяўруга (у ніжнім цячэнні). Выкарыстоўваецца для арашэння. Д. злучаны з Волгай *Волга-Данскім суднаходным каналам.* На Д. — Цымлянская ГЭС і вадасховішча; Мікалаеўскі, Канстанцінаўскі і Кочатаўскі гідравузлы. Суднаходная ад вусця р. Сасна (1604 км), рэгулярнае суднаходства ад г. Ліскі (1355 км). У бас. Д. запаведнікі Галчыная Гара і Хапёрскі. Гал. гарады: Ліскі, Калач-на-Доне, Растоў-на-Доне, Азоў, Валгадонск (порт на Цымлянскім вадасх.).

Літ.: Моложавенко В.С. Голубые родники. От истоков до устья [Дона]. М., 1971.

ДОН (Donne) Джон (22.1 або 12.2.1572, Лондан — 31.3.1631), англійскі паэт, заснавальнік т.зв. метафізічнай школы англ. барока. Вучыўся ў Оксфардскім ун-це. У 1615 прыняў духоўны сан, з 1621 настаяцель сабора св. Паўла ў Лондане. Вершы Д. разыходзіліся ў рукапісах (свядома не друкаваў іх, выпадкова былі апублікаваны пахавальныя элегіі «Шлях душы» і «Анатомія свету», 1611—12). Першы зборнік паэзіі выйшаў пасля смерці Д. ў 1633. Пісаў у жанры сатыры, эпісталы, любоўнай элегіі, санета (найб. вядомы цыкл «Песні і санеты»), духоўнай лірыкі. У позні перыяд пераважалі рэліг. матывы з разваганнямі аб прыродзе чалавечай душы, яе макракосмасе («Святыя санеты»). Адкрытая нанова ў 20 ст. творчасць Д. зрабіла вял. ўплыў на еўрап. паэзію.

Тв.: Рус. пер. — Стихотворения. Л., 1973; У кн.: Английская лирика первой половины XVII в. М., 1989. *Г.В.Сініла.*

ДО́НАР (ад лац. dono дару), чалавек, які добраахвотна дае кроў ці тканкі для лячэння хворых. Адрозніваюць Д. крыві, плазмы, стандартных эрытрацытаў, імуннай плазмы, касцявога мозгу і інш. Д. могуць быць здаровыя, фізічна развітыя людзі пасля 18 гадоў. Пры цяжарнасці, лактацыі, менструацыі, прафілакт. прышчэпках кроў не бяруць. Здаровым людзям донарства не шкодзіць. Паказчык па Беларусі: 45—48 Д. на 1 тыс. чалавек.

ДО́НАР у фізіцы, дэфект крышт. рашоткі паўправадніка (напр., дамешкавы атам), здольны аддаваць электроны ў зону праводнасці. Тыповыя Д. для германію Ge і крэмнію Si — атамы элементаў V групы перыядычнай сістэмы (фосфар P, мыш'як As, сурма Sb). Гл. таксама *Акцэптар, Паўправаднікі.*

ДО́НЕР (Donner) Георг Рафаэль (24.5.1693, Эслінг, цяпер у межах Вены — 15.2.1741), аўстрыйскі скульптар. Вучыўся ў Гайлігенкройцы. Працаваў у Вене (з 1715), Зальцбургу (1725—28), Браціславе (1728—38). Д. захоўваў уласцівую пластыцы *барока* дынаміку і адначасова імкнуўся да класічнай выразнасці формаў. Яго творы ў галіне манум.-дэкар. скульптуры адметныя дынамікай і эфектыўнасцю кампазіцыі, строгай вытанчанасцю формаў (гал. алтар сабора св. Марціна ў Браціславе 1732—34, алегарычныя фігуры для фантана на Новым рынку ў Вене 1737—39 і інш.).

Р.**Донер**. «Бажаство ракі Энс». Фігура для фантана на Новым рынку ў Вене. 1738

ДО́ННАЯ МАРЭ́НА, тып адкладаў *марэны* з грубаабломкавай горнай пароды, моцна ўшчыльненай пад ціскам лёду. Характэрна для покрыўных і горных ледавікоў. Утвараецца ў працэсе намнажэння матэрыялу, які пераносіцца прыдонным слоем ледавіка. Вельмі пашырана на Беларусі.

ДО́ПІНГ (англ. doping ад dope даваць наркотык), стымуляцыя псіхафіз. актыўнасці спартсмена з дапамогай фармакалагічных сродкаў і метадаў, прызнаных Мед. камісіяй Міжнар. алімп. к-та (МАК) допінгавымі. У спіс допінгавых сродкаў уваходзяць: узбуджальныя (амфетамін, эфедрын, кафеін); абязбольваючыя наркатычныя (марфін, кадэін, какаін і інш.); андрагенна-анабалічныя стэроіды (метанабол, 19-нортэстастэрон, станазалол, тэстастэрон); мачагонныя (фурасемід, гідрахлортыязід, ацэтазаламід, аміларод і інш. для хуткага штучнага зніжэння масы цела, прыспешваюць працэс выдзялення мачы, што зніжае канцэнтрацыю ў ёй допінгавых субстанцый і перашкаджае іх выяўленню); пептыдныя гармоны і іх аналагі (плацэнтны ганадатрапін, кортыкатрапін, самататрапін, эрытрапаэтын). Д. з'яўляюцца таксама сродкі, выкарыстанне якіх не забаронена, але мае пэўныя абмежаванні: алкаголь, марыхуана, сродкі мясц. абязбольвання. У

абгрунтаваных мед. паказаннямі выпадках дазваляецца выкарыстанне пракаіну, лідакаіну (ксілакаіну), карбакаіну. Кортыкастэроіды могуць выкарыстоўвацца толькі мясцова пры захворваннях вушэй, вачэй, скуры, пры інгаляцыйнай тэрапіі (астма, алергічны насмарк) і бэта-адрэналітыкі (прапраналол і інш.). Допінгавымі метадамі лічацца аўтатрансфузія (пераліванне ўласнай крыві), гетэратрансфузія (пераліванне донарскай крыві), пераліванне прэпаратаў, якія маюць эрытрацыты (з уласнай або донарскай крыві), фармацэўтычныя, хім., фіз. маніпуляцыі з мэтай падмены саставу пробы біял. вадкасці.

Пошукі пазатрэніровачных спосабаў стымуляцыі псіхафіз. магчымасцей чалавека вяліся яшчэ ў старажытнасці. З канца 19 ст. ў спарт. дысцыплінах, што патрабуюць доўгатэрміновага напружання (напр., веласіпедны спорт), выкарыстоўвалі кафеін, алкаголь, эфір, стрыхнін і абязбольваючыя наркатычныя сродкі. Першыя антыдопінгавыя даследаванні (пачынальнік польскі фармацэўт А.Букоўскі) праведзены ў пач. 20 ст. на скакавых конях на іпадромах Будапешта, Варшавы, Вены. У 1950—60-я г. фармацэўтычныя сродкі пачалі шырока выкарыстоўваць у многіх відах спорту. Першы смяротны выпадак зафіксаваны ў час Алімп. гульняў у 1960 у Рыме (у выніку злоўжывання амфетаміну і вял. напружання пры высокай тэмпературы паветра памёр дацкі веласіпедыст К.Енсен). У 1967 МАК стварыў Мед. камісію, якая распрацавала правілы антыдопінгавага кантролю. На 94-й сесіі МАК (1988, Сеул) прыняты тэкст Міжнар. алімп. антыдопінгавай хартыі, якая вызначае прынцыпы барацьбы з Д., ролю і задачы ў ёй спарт. і ўрадавых арг-цый. У 1989 Антыдопінгавая хартыя прынята Саветам Еўропы.

ДО́ПЛЕР (Doppler) Крысціян Іаган (29.11.1803, г. Зальцбург, Аўстрыя — 17.3.1853), аўстрыйскі фізік, матэматык і астраном. Чл. Аўстрыйскай АН (1848). Скончыў політэхн. ін-т у Вене (1825). У 1829—49 у розных ун-тах Аўстрыі, Чэхаславакіі і Германіі. З 1850 праф. Венскага ун-та. Навук. працы па оптыцы, акустыцы, тэорыі мікраскопа і оптычнага дальнамера, тэорыі колераў і інш. У 1842 тэарэт. абгрунтаваў залежнасць частаты прынятых ваганняў ад скорасці і напрамку руху крыніцы ваганняў адносна назіральніка (гл. *Доплера эфект*).

ДО́ПЛЕРА ЭФЕ́КТ, змена частаты ваганняў (або даўжыні хвалі), якая назіраецца пры адносным руху назіральніка і крыніцы ваганняў; пры збліжэнні назіральніка і крыніцы частата прынятых ваганняў павялічваецца, пры аддаленні — памяншаецца. Тэарэтычна абгрунтаваны ў акустыцы і оптыцы К.*Доплерам* (1842). Наяўнасць Д.э. ў оптыцы даказана эксперыментальна А.А.*Белапольскім* у 1900. Выкарыстоўваецца для вызначэння скорасці руху крыніц выпрамянення ў спектраскапіі, астрафізіцы, радыё- і гідралакацыі і інш.

Д.э. выяўляецца для хвалевых і няхвалевых рухаў любой прыроды пры назіранні іх у 2 сістэмах адліку, якія рухаюцца адна адносна другой. Падвойны Д.э. — зрушэнне частаты хваль, адбітых ад рухомых цел (адбівальны аб'ект можна спачатку разглядаць як прыёмнік, а потым як перавыпрамяльнік хваль). У нестацыянарных асяроддзях (параметры асяроддзя мяняюцца ў часе) змена частаты можа адбывацца і пры нерухомых крыніцы і прыёмніку (параметрычны Д.э.).

ДО́ПУСКІ, рознасць (дапушчальныя адхіленні) паміж найбольшымі і найменшымі гранічнымі значэннямі (памерамі) якога-небудзь параметра (геам., мех., фізіка-хім. і інш.).

У машынабудаванні прынята сістэма Д. і пасадак, якая забяспечвае ўзаемазамяняльнасць дэталей і вузлоў, дазваляе ажыццяўляць злучэнні з рухомымі, нерухомымі і пераходнымі пасадкамі. Д. ўстанаўліваюцца на намінальныя памеры вала і адтуліны, а таксама дэталей іншых формаў (напр., абмежаваных 2 паралельнымі плоскасцямі). У сістэме адтуліны ніжняе гранічнае адхіленне памеру адтуліны роўна 0, а розныя пасадкі атрымліваюць зменай Д. вала; у сістэме вала верхняе гранічнае адхіленне памеру вала роўна 0, а розныя пасадкі атрымліваюць зменай Д. адтуліны. Д. рэгламентуюцца *класамі дакладнасці*. Будаўніцтве сістэма Д. вызначаецца будаўнічымі нормамі і правіламі.

ДОПШ (Dopsch) Альфонс (14.6.1868, г. Ловасіцы, Чэхія — 1.9.1953), аўстрыйскі гісторык. Праф. Венскага ун-та (1900—38). Аўтар прац «Эканамічнае развіццё ў эпоху Каралінгаў, галоўным чынам у Германіі» (т. 1—2, 1912—13), «Эканамічныя і сацыяльныя асновы культурнага развіцця Еўропы ад часоў Цэзара да Карла Вялікага» (т. 1—2, 1918—20), «Натуральная гаспадарка і грашовая эканоміка ў сусветнай гісторыі» (1930), «Улада і селянін у часы Германскай імперыі» (1939) і інш., у якіх сцвярджаў бесперапыннасць гіст. працэсу ад антычнасці да сярэдневякоўя.

ДО́ПЫТ, следчае або судовае дзеянне, якое заключаецца ў атрыманні ад сведкі, пацярпелага, падазронага, абвінавачанага або падсуднага вуснага паказання пра вядомыя яму акалічнасці дадзенай справы. Адзін з спосабаў набыцця і замацавання *доказаў судовых*. Правілы Д. вызначаны працэсуальным заканадаўствам. Д. правамоцны праводзіць толькі работнікі органаў дазнання і папярэдняга следства, пракуроры і суд, а ў цывільным працэсе — таксама істцы і адказчыкі ці іх прадстаўнікі. Вынікі Д. фіксуюцца ў адпаведных следчых або суд. пратаколах, Д. можа суправаджацца аўдыё- або відэазапісам. *Э.І.Кузьмянкова.*

ДО́РАХ Ніна Пятроўна (н. 25.7.1956, в. Перавалока Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. спартсменка (веславанне на байдарках і каноэ). Засл. майстар спорту (1979). Скончыла Гомельскі ун-т (1980). Чэмпіёнка свету і Еўропы (1979), сярэбраны прызёр чэмпіяната свету і Еўропы (1978) на байдарцы-двойцы на дыстанцыі 500 м, бронзавы прызёр (1977) на байдарцы-чацвёрцы на дыстанцыі 500 м. Неаднаразовая чэмпіёнка СССР.

ДО́РАХАЎ Іван Сямёнавіч (23.9.1762 — 25.4.1815), расійскі ваенны дзеяч, ген.-лейт. (1812). Скончыў Артыл. і інж. шляхетны кадэцкі корпус у Пецярбургу (1787). Удзельнік рус.-тур. вайны 1787—91, кампаніі па задушэнні *паўстання 1794*. Вызначыўся ў войнах супраць Францыі 1805 і 1806—07, у рус.-швед. вайне 1808—09. Напярэдадні вайны 1812 у 4-м пяхотным корпусе 1-й арміі, камандзір карпуснога авангарда. Пасля бою 30 чэрв. каля Вял. Салечнікаў (цяпер Шальчынінкай, Літва) быў вымушаны адступіць. 6 ліп. спрабаваў адбіць у французаў Валожын, аднак пры набліжэнні вял. сіл праціўніка адышоў на Камень (Валожынскі р-н). 7 ліп. злучыўся каля Стоўбцаў з 2-й арміяй П.І.*Багратыёна*. Удзельнічаў у *Смаленскай аперацыі 1812* і ў *Барадзінскай бітве 1812*. У вер. — кастр. 1812 камандзір асобнага атрада, заняў г. Верая (Маскоўская вобл.). У бітве каля Малаяраслаўца цяжка паранены. Біяграфія Д., складзеная яго сынам Руфінам у 1850, захоўваецца ў Нац. б-цы Беларусі (фонд І.Ф.Паскевіча).

ДО́РСЕТ (Dorset), старажытнаэскімоская культура (пач. 1-га тыс. да н.э. — пач. 2-га тыс. н.э.), адкрыта ў 1925 на мысе Дорсет (в-аў Бафінава Зямля). Пашырана на ПнУ Канады, Канадскім Арктычным архіпелагу, у зах. і паўн.-зах. Грэнландыі. Для Д. характэрны абабітыя каменныя прылады працы, астрогі, іголкі, скульптура з косці, біўня, дрэва, наразны лінейны арнамент. Вылучана 5 перыядаў развіцця культуры; у апошнім выяўляюцца рысы эскімоскай культуры Туле, якая пасля 1200 н.э. змяніла Д.

ДО́РСКІ Іосіф Львовіч (17.12.1911, Мінск — 7.12.1964), бел. тэатр. дзеяч і драматург. Засл. дз. маст. Беларусі (1961). Скончыў курсы кінасцэнарыстаў у Мінску (1930). Працаваў на кінафабрыцы «Савецкая Беларусь» у Ленінградзе (1931—33). З 1935 заг. літ. часткі БДТ-2 (т-р імя Я.Коласа). З 1948 дырэктар тэатра т-ра. З 1961 дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм». Літ. дзейнасць пачаў у 1930. Аўтар драмы «Цэнтральны ход» (1948) і лірычнай камедыі «Алазанская даліна» (1949; абедзве з К.Губарэвічам, пастаўлены ў т-ры імя Я.Коласа), п'есы «Права на шчасце» (пастаўлена ў т-ры імя Я.Коласа і ў драм. т-ры ў г. Вялікія Лукі), нарысаў, артыкулаў па праблемах тэатр. мастацтва.

ДО́РСКІ Сямён Львовіч (20.10.1920, Мінск — 14.1.1992), бел. перакладчык. Канд. філал. н. (1961), дац. (1965). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1947). З 1947 працаваў у БДУ, з 1962 у Мінскім пед. ін-це замежных моў. Друкаваўся з 1957. Перакладаў з англ., франц., ісп. і ням. моў. На бел. мову пераклаў раманы П.Абрахамса «Вянок для Удома» (1959), І.Кардэнаса Акуньі «Загадка адной нядзелі» (1979), К.Маккалаў «Птушкі на цернях» (1988), Дж.Э.Стэйнбека «Гронкі гневу» (1993), п'есу Э.Заля «Наследнікі Рабурдэна» (паст. 1960), аповесці Л.Рэна «Негр Нобі» (1962), П.Джойса

«Цікі» (1977), Д.Алонса «У пошуках чорнай чайкі» (1982), зб. казак Г.Прокапа «Пятае кола» (1980) і інш.

ДО́РТМУНД (Dortmund), горад на З Германіі, у зямлі Паўн. Рэйн-Вестфалія. Рэзідэнцыя *Карла Вялікага*, гар. прав. з 13 ст. 602 тыс. ж. (1994). Буйны трансп. вузел — усходнія «вароты» Рура. Порт на р. Эмшэр (прыток р. Рэйн); звязаны з Паўночным м. каналам Д.-Эмс. Важны індустр. цэнтр Рурскага прамысл. раёна. Гал. галіны прам-сці: чорная металургія, машынабудаванне (пераважна металургічнае, пад'ёмна-трансп. абсталяванне, станка- і лакаматывабудаванне, эл.-тэхн.), тэкст., хім. (вытв-сць угнаенняў і пластмас), харчасмакавая (найбуйнейшы ў Еўропе цэнтр вытв-сці піва). Ун-т. Музеі, у т.л. сярэдневяковага мастацтва ў замку Капенберг. Арх. помнікі 12—15 ст.

ДО́РТМУНДСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т. Засн. ў 1965 у г. Дортмунд (Германія). Адкрыты ў 1968. Ф-ты: матэм., фіз., хім., хім. тэхналогій, камп'ютэрных навук, машынабудавання, электратэхнікі, планавання гарадоў і населеных пунктаў, эканам. і сац. навук, адукацыі і біялогіі, спец. адукацыі і рэабілітацыі асоб з цяжкасцямі ў стане здароўя, гуманіт. навук, у т.л. тэалогія, паліт. навукі, псіхалогія і эканоміка хатняй гаспадаркі, мовы і л-ры, журналістыкі, гісторыі, музыкі, мастацтва, спорту і геаграфіі. Пры ун-це працуюць 5 ін-таў і 3 цэнтры. *В.М.Навумчык.*

ДО́РУ (Douro), рака, гл. *Дуэра.*

ДО́РЫ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл., каля аўтастрады Мінск—Ашмяны. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на У ад Валожына, 60 км ад Мінска, 23 км ад чыг. ст. Аляхновічы. 567 ж., 223 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Царква. Магіла ахвяр фашызму.

ДОС ПА́САС (Dos Passos) Джон Радэрыга (14.1.1896, г. Чыкага, ЗША — 28.9.1970), амерыканскі пісьменнік. З партуг. эмігрантаў. Скончыў Гарвардскі ун-т (1916), з 1917 добраахвотнікам удзельнічаў у 1-й сусв. вайне. Адным з першых пачаў пісаць у рэчышчы л-ры «страчанага пакалення» (раманы «Пасвячэнне аднаго маладога чалавека — 1917», 1920; «Тры салдаты», 1921). Наватарства Д.П. ў найб. ступені праявілася ў рамане «Манхэтэн» (1925), трылогіях «ЗША» («42-я паралель», 1930; «1919», 1932; «Вялікія грошы», 1936) і «Акруга Калумбія» (1939—48), рамане «У сярэдзіне стагоддзя» (1961). Апублікаваў маст. аўтабіяграфію «Лепшыя часы» (1966). Пісьменнік асэнсоўваў праблемы чалавека ў індустр. грамадстве ЗША, з яго «амерыканскай марай» пачатку стагоддзя і вял. дэпрэсіяй 1930-х г., з крахам ілюзій і стратай ідэалаў. Яго творам уласцівы маштабнасць абагульненняў, імпрэсіяністычнасць, асацыятыўнасць. *Е.А.Лявонава.*

ДО́САЎСКАЯ МЕДЗЕПЛАВІ́ЛЬНАЯ МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1832—84 у в. Досава Быхаўскага пав. (цяпер в. Дасовічы ў Магілёўскім р-не). У 1852 мела горн з 2 мяхамі і кацельную, у 1859—84 дзейнічаў вадзяны рухавік. Выпускала вінакурныя трубы, катлы, ліставую медзь, дыстылятары, самавары і медны посуд. Сыравіну (лом чырвонай медзі) атрымлівалі з Магілёва. У 1847 працавалі 52 рабочыя, з іх 51 — прыгонныя.

ДО́СІ (Досе), рака ў Бразіліі, гл. *Рыу-Досе.*

ДО́СІ (Dossi) Доса [сапр. Джавані дэ Лутэра; Giovanni de Lutera; каля 1479—90, г. Мантуя (?), Італія — 26.7.1542], італьянскі жывапісец Позняга *Адраджэння*; прадстаўнік *ферарскай школы жывапісу*. Працаваў пры дварэ герцагаў ферарскіх. Аўтар эмацыянальна-рамант. карцін на міфалагічныя, алегарычныя і рэліг. тэмы, часта напісаных на фоне паэтычна-казачнага пейзажа («Німфа і сатыр», «Апалон, які іграе на скрыпцы», 1530-я г.). Ствараў таксама партрэты («Партрэт Альфонса д'Эстэ», пасля 1528) і дэкар. размалёўкі.

Д.Досі. Партрэт Альфонса д'Эстэ. Пасля 1528.

ДО́СЛЕД, агульнанавуковы метад вывучэння з'яў аб'ектыўнага свету ў спецыяльна створаных, дакладна вызначаных умовах. Адрозніваецца ад назіранняў актыўным аперыраваннем аб'ектам, які вывучаецца. Ажыццяўляецца на аснове тэорыі, што вызначае пастаноўку задач і інтэрпрэтацыю яго вынікаў. Д. — праверка гіпотэз і пацвярджэнне тэорыі; часам выступае як адна з формаў практыкі (*эксперыменту*), выконвае функцыю крытэрыю сапраўднасці, навук. пазнання ўвогуле. З развіццём навукі і тэхнікі межы выкарыстання Д. пашыраюцца, ён робіцца больш складаным. Вял. значэнне мае сац. Д., які дапамагае выяўляць і даследаваць працэсы сац.-эканам., паліт. і духоўнага развіцця грамадства.

ДОСТ МУХА́МЕД (1790 ці 1793—9.6.1863), эмір (правіцель) Афганістана ў 1834—40 і 1842—63. Дваццаты сын Паінда-хана, правадыра племені баракзаяў. Пасля распаду *Дуранійскай дзяржавы* (1818) кіраваў (з 1826—27) Кабульскім і Газнійскім княствамі. У 1834 абвясціў сябе эмірам, заснаваў Баракзайскую дынастыю; намагаўся аб'яднаць афг. землі. У 1-ю англа-афг. вайну 1838—42 (гл. *Англа-афганскія войны*) паланёны англічанамі (канец 1840) і высланы ў Індыю. З 1842 зноў на афг. троне. У 1855—63 далучыў Кандагар, Усх. Сістан, Герат, землі на левабярэжжы Амудар'і.

ДО́СТАЛАВА (Dostálová) Леапольда (23.1.1879, Велеславін, каля Прагі —?), чэшская актрыса. Нар. арт. ЧССР (1947). У 1901—20 і з 1924 у пражскім Нац. т-ры. У 1920—24 у пражскім Гар. т-ры на Вінаградах. Актрыса вял. тэмпераменту, стварала вобразы моцных духам, апанаваных страсцямі жанчын: лэдзі Макбет («Макбет» У.Шэкспіра), Антыгона («Антыгона» Сафокла), Медэя («Медэя» Эўрыпіда), Баладзіна («Баладзіна» Ю.Славацкага), Эмілія Марці («Сродак Макропуласа» К.Чапека), Бабуля («Ліхтар» А.Ірасека), Людміла («Драгаміры» І.Тыла) і інш. Дзярж. прэмія ЧССР 1946.

ДО́ТЫК, здольнасць чалавека і жывёл успрымаць уздзеянні вонкавага асяроддзя з дапамогай *рэцэптараў* скуры, апорна-рухальнага апарата (мышцаў, сухажылляў, суставаў і інш.), слізістых абалонак (на губах, языку і інш.) і пераўтвараць сігналы ў пэўны від *адчувальнасці*. Аснова Д. — раздражненне розных відаў рэцэптараў (*механарэцэптараў*, якія ўспрымаюць дакрананне, ціск, расцяжэнне, *тэрмарэцэптараў* — цяпло і холад, рэцэптараў болю) і пераўтварэнне інфармацыі ц.н.с. Успрыманне прадметаў вонкавага асяроддзя з дапамогай Д. дазваляе ацэньваць іх форму, памеры, уласцівасці паверхні, кансістэнцыю, т-ру, сухасць і вільготнасць, становішча і перамяшчэнне ў прасторы. У многіх беспазваночных Д. разам з хім. адчувальнасцю — асн. від успрымання раздражненняў вонкавага асяроддзя. Д. у пэўнай меры замяняе інш. органы пачуццяў (зрок, слых) пры іх пашкоджанні.

ДО́У (Dawe) Джордж (8.2.1781, Лондан — 15.10.1829), англійскі жывапісец. У 1819—29 працаваў у Пецярбургу, дзе напісаў (з дапамогай рус. жывапісцаў) 329 партрэтаў генералаў — удзельнікаў Айч. вайны 1812 і паходаў 1813—14, у т.л. М.І.Кутузава і М.Б.Барклая дэ Толі, выконваў таксама прыватныя заказы. Партрэтам Д. ўласцівы рамант. прыўзнятасць, жывасць характарыстык, віртуознасць жывапісу.

Дж.Доу. Партрэт А.С.Шышкова. Каля 1825.

ДО́ЎБАН Карней Іванавіч (н. 25.10.1928, в. Глушкавічы Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне аграхіміі. Д-р с.-г. н. (1984). Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1962). З 1988 нам. дырэктара Бел. навук. цэнтра інфарматыкі і маркетынгу аграпрома, з 1991 на прадпрыемстве «БелГЕА». Навук. працы па выкарыстанні сідэратаў (бабовых, крыжакветных і інш.) як прамежкавых культур, якія не займаюць самастойнага поля, па эфектыўнасці станоўчага ўплыву зялёных угнаенняў на ўрадлівасць і якасць яравых культур і павышэнне ўрадлівасці глеб.

Тв.: Применение зеленых удобрений в интенсивном земледелии. Мн., 1981; Зеленое удобрение. М., 1990.

ДО́ЎБАР-МУСНІ́ЦКАГА МЯЦЕ́Ж 1918, антысавецкае ўзбр. выступленне 1-га польск. корпуса на чале з Ю.Р.*Доўбар-Мусніцкім*.

Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 са згоды сав. ўрада корпус (3 дывізіі, 25—29 тыс. легіянераў) пачаў канцэнтравацца ў раёне Рагачоў—Жлобін—Бабруйск. Аднак яго камандаванне не выконвала пастаноў новай улады аб дэмакратызацыі войска, не дазваляла канфіскацыю памешчыцкіх маёнткаў і нацыяналізацыю прадпрыемстваў, легіянеры рабавалі мясц. насельніцтва. Сав. ўлады ў снеж. 1917 часова арыштавалі Доўбар-Мусніцкага і некат. афіцэраў, у студз. 1918 выдалі загад аб расфарміраванні корпуса.

У адказ 25.1.1918 Доўбар-Мусніцкі аб'явіў вайну Сав. рэспубліцы, 26.1.1918 захапіў Рагачоў, 3.2.1918 — Бабруйск. Супраць мяцежнікаў накіраваны атрад чырвонагвардзейцаў (каля 10 тыс. чал.) на чале з І.Вацэцісам. 13.2.1918 1-я польск. дывізія цалкам разбіта пад Рагачовам, горад вызвалены. 2-я дывізія адышла да Бабруйска, куды рухаліся астатнія часці корпуса. Большасць польск. палкоў былі раззброены па дарозе на Бабруйск. У выніку праведзенай бальшавікамі і палякамі-інтэрнацыяналістамі агітац. работы значная колькасць легіянераў перайшла ў сав. ваен. фарміраванні. З іх утвораны 1-ы польскі рэв. батальён у Віцебску, польскі батальён рэв. палка імя Мінскага Савета і інш. У люг. 1918 часці корпуса па дамоўленасці з вярх. камандаваннем герм. войск пачалі наступленне на Мінск, нанеслі паражэнне сав. войскам каля чыг. станцый Ясень і Асіповічы, 20.2.1918 захапілі Мінск. 26.2.1918 у Бабруйску заключана пагадненне аб падпарадкаванні 1-га польск. корпуса немцам. У маі 1918 корпус расфарміраваны.

У.М.Міхнюк

ДО́ЎБАР-МУСНІ́ЦКІ (Dowbor-Musnicki) Юзаф Рамуальдавіч (25.10.1867, мяст. Гарбаў Сандамірскага пав. Радамскай губ. — 28.10.1937), рускі і польскі ваен. дзеяч, ген.-лейт. рус. арміі (1917), ген. броні польскага войска; кіраўнік мяцяжу супраць сав. улады на Беларусі ў 1918. Скончыў Акадэмію

Генштаба (1902). Удзельнік рус.-яп. вайны. У час 1-й сусв. вайны камандзір дывізій на Каўказскім і Паўн. франтах. У снеж. 1916 загадаў расстраляць без суда і следства 13 салдат, пасля чаго пераведзены на Зах. фронт камандуючым 38-м арм. корпусам 10-й арміі. У крас. 1917 выведзены са складу дэлегатаў з'езда арміі за манархічныя выступленні. У ліп. 1917 арганізаваў на Зах. фронце 1-ы польскі корпус. 25.1.1918 аб'явіў вайну Сав. Рэспубліцы (гл. *Доўбар-Мусніцкага мяцеж 1918*). З канца 1918 служыў у польскім войску. У 1919 арганізатар і камандуючы польск. войскамі ў час антыгерм. паўстання ў т.зв. прускай Польшчы. Аўтар мемуараў пра дзейнасць 1-га польск. корпуса на Беларусі.

У.М.Міхнюк.

ДО́ЎБНЯ Іван Пятровіч (31.1.1853, г. Пінск — 2.2.1912), расійскі матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1896), праф. (1897). Скончыў Пецярбургскі горны ін-т (1875). Выкладаў матэматыку ў навуч. установах г. Арэнбург (1877—80) і г. Ніжні Ноўгарад (1880—96). З 1896 у Пецярбургскім горным ін-це (з 1910 рэктар). Навук. працы па алгебры, тэорыі абелевых інтэгралаў, эліптычных функцый, дыферэнцыяльных ураўненняў з частковымі вытворнымі, па метолыцы выкладання матэматыкі.

Тв.: Исследования по теории абелевых интегралов. СПб., 1896.

Літ.: Крылов Н.М. И.П.Долбня. СПб., 1912. *А.А.Гусак.*

ДО́ЎБУШ Алекса Васілевіч (1700, с. Печанежын Івана-Франкоўскай вобл., Украіна — 4.9.1745), кіраўнік нац.-вызв. і антыфеад. руху ўкр. *апрышкаў*. Атрад Д. (каля 50 чал.) у 1738—45 дзейнічаў на тэр. зах. раёнаў Украіны (Галіцыя, Букавіна, Закарпацце), нападаў на маёнткі шляхты, арандатараў, захопліваў іх маёмасць і раздаваў сялянам. Быў забіты. Імя Д. вядома таксама ў Польшчы, Малдове, Венгрыі.

ДОЎГАВІЧЫ, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Кашанка. Цэнтр сельсавета. За 33 км на ПдЗ ад Мсціслава, 80 км ад Магілёва, 14 км ад чыг. ст. Ходасы. 438 ж., 187 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі.

ДО́ЎГАЕ, вёска ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Даўжанка. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 29 км на ПнУ ад г. Клічаў, 66 км ад Магілёва, 11 км ад чыг. ст. Мілае. 515 ж., 196 двароў (1997). Ляснічтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі.

ДО́ЎГАЕ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл., каля р. Случ. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 39 км на Пд ад Мінска і чыг. ст. Салігорск, 166 км ад Мінска. 1851 ж., 595 двароў (1997). ВМК-79, акц. прадпрыемства «Доўгае». Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Царква, малітоўны дом хрысціян евангельскай веры. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДО́ЎГАЕ, гідралагічны заказнік на тэр. Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Створаны як азёрны заказнік для аховы азёр і прылеглых прыродных комплексаў у 1979. Пл. 3,3 тыс. га (1997). Размешчаны на ПнУ Свянцянскіх град. Уключае *Доўгае возера*, воз. *Псуя* (бас. р. Зах. Дзвіна) і прылеглую частку вадазборнай плошчы. Лясы (у асноўным елка з дамешкам бярозы і асіны) пераважна ў паўд.-ўсх. ч. Трапляюцца хвойнікі, у лагчынах — шэраалешнікі. Лясістасць 15%, па берагах — 25%. У далінах рэк невял. лугі. У фітапланктоне воз. Доўгае выяўлена рэдкая водарасць асцыляторыя чырванаватая.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Шоша, за 32 км на ПнУ ад г. Глыбокае. Пл. 2,6 км^2, даўж. 6 км, найб. шыр. 700 м, найб. глыб. 53,7 м (самае глыбокае на Беларусі), даўж. берагавой лініі каля 15 км. Пл. вадазбору 30,4 км^2. Катлавіна глыбока (на 70—80 м) урэзана ў тоўшчу марэнных адкладаў, схілы выш. да 30 м (на ПнЗ і ПдУ да 10 м), пераважна пад хмызняком, на асобных участках параслі лесам. Берагі ў асноўным зліваюцца са схіламі, на ПнЗ і ПдУ нізкія, парослыя хмызняком. Падводныя схілы катлавіны вельмі стромкія. У цэнтр. ч. возера некалькі глыбокіх упадзін, раздзеленых падняццямі дна. Зона мелкаводдзя пясчаная і пясчана-галечная, уздоўж усх. і зах. берагоў месцамі выслана валунамі. Пяскі да глыб. 10—15 м, глыбей ложа выслана глінамі, якія ў глыбакаводнай ч. змяняюцца глеямі. У залівах фарміруюцца сапрапелі. Водная маса адметная вял. колькасцю кісларода ва ўсёй тоўшчы і нізкімі т-рамі; у летні час паверхневы слой вады да глыб. 7—8 м прагравацца да 18—20 °С, ніжэй за 20 м — да 5—6 °С. У прыбярэжнай зоне паласа надводнай расліннасці шыр. да 25 м, месцамі адсутнічае. Падводная расліннасць пашырана да глыб. 5—7 м. Жывёльны свет багаты, адзначаны пасяленні баброў, ёсць рэлікт ледавіковага перыяду — рачок лімнакалянус, занесены ў Чырв. кнігу Беларусі. Каб захаваць унікальны вадаём, возера і прыбярэжная тэр. аб'яўлены гідралаг. заказнікам *Доўгае*. На Пн і ПнЗ упадаюць ручаі з азёр Свядава і Псуя, на Пд выцякае ручай у воз. Шо.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрысвята (цячэ праз возера), за 24 км на ПдЗ ад г. Браслаў. Пл. 1,87 км^2, даўж. 3,5 км, найб. шыр. 1,3 км, найб. глыб. 31 м, даўж. берагавой лініі 13,3 км. Пл. вадазбору 83,3 км^2. Схілы катлавіны выш. 7—10 м (на ПдЗ да 5 м, спадзістыя), параслі хваёвым і мяшаным лесам, на Пд разараныя. Берагі пераважна абразійныя, абрывістыя, на асобных участках зліваюцца са схіламі, у паўн. заліве сплавінныя, пад хмызняком і лесам. Дно складанай будовы (плоскія ўчасткі глыб. да 5 м чаргуюцца з глыбокімі ўпадзінамі і мелямі). 6 астравоў агульнай пл. 6,3 га. Прыбярэжная ч. дна да глыб. 3—4 м (месцамі да 5 м) пясчаная, глыбей глеі і сапрапелі. Пры вытоку на р. Дрысвята пабудавана ГЭС, у выніку чаго ўзровень возера падняўся да 5 м, аднавіліся працэсы перапрацоўкі берагоў. Адзначаецца сутачнае ваганне ўзроўню 0,2 м. Поўнасцю зарастаюць залівы.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Эса, за 4 км на ПдУ ад г. Лепель. Пл. 0,69 км^2, даўж. 2,5 км, найб. шыр. 450 м, найб. глыб. 6,1 м, даўж. берагавой лініі 6,7 км. Пл. вадазбору 7,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 8—10 м (на У да 4 м), разараныя, месцамі пад лугам. Берагі ўчасткамі параслі хмызняком. Дно плоскае, выслана сапрапелямі, зона мелкаводдзя пясчаная. Шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці да 10 м. У возера ўпадаюць 3 ручаі, на Пд выцякае ручай у Задняе возера.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зеха, за 13 км

Доўгае возера ў Глыбоцкім раёне.

на ПнЗ ад г. Лепель. Пл. 0,65 км², даўж. 2,6 км, найб. шыр. 360 м, найб. глыб. 28,4 м, даўж. берагавой лініі 5,6 км. Пл. вадазбору 9,2 км². Схілы катлавіны выш. 10—12 м, параслі лесам, на Пн і ПнЗ часткова разараныя. Берагі амаль усюды зліваюцца са схіламі, на Пд і ПдУ нізкія. Падводная ч. катлавіны стромка-ўвагнутай формы з рэзкім павелічэннем глыбінь у цэнтры. Паўн.-зах. ч. возера мелкаводная. Дно да глыб. 8 м выслана пясчанымі адкладамі, глыбей — сапрапелямі. Шыр. паласы надводнай расліннасці да 50 м. На ПнУ з возера выцякае ручай у воз. Пышна.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл., у бас. р. Бярвенка (выцякае з возера), за 34 км на ПнЗ ад г. Шчучын. Пл. 0,5 км², даўж. 1,1 км, найб. шыр. 680 м, даўж. берагавой лініі каля 3 км. Схілы катлавіны выш. да 10 м, пад лесам, на ПнУ і ПнЗ месцамі разараныя. Берагі нізкія, забалочаныя, пад хмызняком, месцамі сплавінныя. Дно выслана сапрапелем.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Нешчарда, за 16 км на У ад г.п. Расоны. Пл. 0,48 км², даўж. 1,2 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 5,6 м, даўж. берагавой лініі больш за 3 км. Пл. вадазбору 1,9 км². Схілы катлавіны выш. 2—4 м, пад хваёвым лесам, на У разараныя. Берагі месцамі забалочаныя, пад хмызняком. Дно пясчанае, глыбей 2 м выслана сапрапелем. Зарастае слаба, шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці 15—30 м. Злучана пратокамі з азёрамі Круглае і Нешчарда.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Крашанка, за 20 км на Пд ад г. Полацк. Пл. 0,26 км², даўж. 800 м, найб. шыр. 420 м, найб. глыб. 2,8 м, даўж. берагавой лініі каля 3 км. Пл. вадазбору 4 км². Схілы катлавіны выш. 5 м, пад лесам. Берагавая лінія звілістая, утварае некалькі заліваў. У цэнтры возера востраў пл. 0,4 га. Дно выслана сапрапелем. Злучана ручаём з воз. Уклеенка.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Нача, за 25 км на ПдЗ ад г. Полацк. Пл. 0,23 км², даўж. 930 м, найб. шыр. 270 м, даўж. берагавой лініі больш за 2 км. Пл. вадазбору 1,75 км². Схілы катлавіны выш. да 10 м, пад хмызняком, на Пд разараныя.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, у Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Астроўніца (выцякае з возера), за 26 км на ПнУ ад г.п. Бешанковічы. Пл. 0,21 км², даўж. 980 м, найб. шыр. 220 м, даўж. берагавой лініі больш за 2 км. Пл. вадазбору 38,9 км². Схілы катлавіны выш. да 8 м, пад хмызняком. Берагі высокія. У возера ўпадаюць ручаі з азёр Астроўна і Мелкае.

ДО́ЎГАЕ ВО́ЗЕРА, ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Тураўлянка, за 25 км на ПнУ ад г.п. Ушачы. Пл. 0,21 км², даўж. 1,3 км, найб. шыр. 240 м, найб. глыб. 5 м, даўж. берагавой лініі 3 км. Пл. вадазбору 5,8 км². Схілы катлавіны выш. 8—10 м (на З да 6 м), пераважна пад хмызняком, на З месцамі разараныя. Берагі высокія, на У зліваюцца са схіламі, на Пд і З месцамі сплавінныя. На Пн упадае ручай з воз. Рукшанскае, злучана ручаём з воз. Плацішна.

ДО́ЎГАЯ ЛІ́НІЯ, электрычная лінія, утворваная 2 доўгімі правадніками, адлегласць паміж якімі значна меншая за даўжыню хвалі электрамагнітных ваганняў, што па ёй перадаюцца. Асн. характарыстыкі: хвалевае супраціўленне і каэфіцыент распаўсюджвання эл.-магн. хваль. З'яўляецца сістэмай з размеркаванымі параметрамі (кожны элемент даўжыні Д.л. мае адначасова пэўныя значэнні індуктыўнасці, ёмістасці, актыўнага супраціўлення і інш.). Адрозніваюць Д.л. аднародныя (з нязменнымі параметрамі ўздоўж лініі), нескажальныя (захоўваюць форму пададзенага сігналу) і ўзгадняльныя (нагрузка роўная хвалеваму супраціўленню). Працуюць у рэжыме стаячай хвалі (поўнае адбіццё энергіі ад канца лініі), бягучай хвалі (поўнае паглынанне энергіі на канцы лініі) або прамежкавым. Адрозні Д.л. выкарыстоўваюцца ў якасці вагальных контураў, ізалятараў, узгадняльных трансфарматараў, а таксама для перадачы інфармацыі ў тэлеф.-тэлегр. сувязі, тэлебачанні, радыёлакацыі, эл.-энергетыцы. Гл. таксама *Лінія сувязі*.

А.П.Ткачэнка.

ДО́ЎГІ ПАРЛА́МЕНТ (Long parliament), скліканы 3.11.1640 англійскім каралём *Карлам I* пасля няўдалай спробы атрымаць падаткі ад Кароткага парламента і чарговага паражэння ў барацьбе з шатл. прэсвітэрыянамі. Праіснаваў больш за 12 гадоў (адсюль назва). У 1641 пад уплывам антыкаралеўскай большасці Д.п. сфармуляваў свае патрабаванні да караля аб рэформе англіканскага права, ліквідацыі каталіцкага ўплыву, змене ў сістэме кіравання і інш. («Вялікая рэманстрацыя»). У 1642—46 кіраваў вайной супраць Карла I. У 1653 разагнаны О.*Кромвелем*. У 1660 адноўлены ген. Дж.Монкам, ухваліў правядзенне выбараў і распусціўся.

ДО́ЎГІРД Анёл (2.12.1776, маёнтак Юркаўшчына, Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. — 26.4.1835), бел. філосаф, логік, псіхолаг. Скончыў Віленскую акадэмію. Выкладаў у піярскіх школах. У 1818—32 праф. Віленскага ун-та. Лічыў, што сусвет, аднойчы створаны Богам, надалей падпарадкоўваецца натуральным законам. Прадметы і іх уласцівасці існуюць незалежна ад нашай свядомасці. Крытыкаваў філасофію І.Канта, фармалізм і схематызм яго логікі і трансцэндэнтальнай эстэтыкі. Псіхал. і пед. погляды Д. абапіраліся на даследаванні здольнасцей чалавека, а яго эстэт. канцэпцыя своеасабліва спалучала класіцызм і рамантызм. Пазнію лічыў гал. жанрам мастацтва, пісаў вершы. Падрыхтаваў 3 тамы твораў па логіцы (т. 1, Полацк, 1828), манаграфію «Аб логіцы, метафізіцы і маральнай філасофіі» (Вільня, 1821). Абараніў доктарскую дысертацыю па тэалогіі «Аб цудзе» і інш.

Тв.: У кн.: Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн., 1962.

Літ.: Дорошевич Э.К. Аниол Довгирд — мыслитель эпохи Просвещения. Мн., 1967.

Э.К.Дарашэвіч.

ДО́ЎГІЯ КУРГАНЫ́, валападобныя пахавальныя насыпы 2-й пал. 1-га тыс. чагоддзя ў Бел. Падзвінні і Верхнім Падняпроўі, у вярхоўях р. Вялікая і каля Пскоўскага возера Расіі. Нар. назва на Пн Беларусі — валатоўкі. Даўжыня курганоў у 2 і больш разоў перавышае шырыню, часам дасягае некалькіх дзесяткаў метраў. На Беларусі выяўлены Д.к. 5—6 і 8—10 ст. Яны адлюстроўваюць перыяд, калі на Пн лясной паласы Беларусі з'явіліся славяне, якія асімілявалі мясц. балцкае і фіна-угорскае насельніцтва, утварылі групоўку ўсх. славян — *крывічоў*, вылучана археал. культура доўгіх курганоў паўн. Беларусі. Пахавальны абрад — трупаспаленне (у больш ранніх — за межамі пахавання). У кургане звычайна некалькі пахаванняў у ляпных гаршках-урнах ці ямках. Пахавальны інвентар некаторых курганоў — бронзавыя бранзалеты, ланцужкі, падвескі, шкляныя пацеркі сіняга колеру, жал. спражкі, нажы, касяныя падвескі-птушкі. Большасць пахаванняў амаль без інвентару, што сведчыць пра асаблівасці рытуалу.

Літ.: Седов В.В. Длинные курганы кривичей. М., 1974; Штыхаў Г.В. Крывічы. Мн., 1992.

Г.В.Штыхаў

ДО́ЎЖА, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мядзелка, за 7 км на Пд ад г. Паставы. Пл. 1,04 км², даўж. 4,9 км, найб. шыр. 420 м, найб. глыб. 13,7 м, даўж. берагавой лініі больш за 12 км. Пл. вадазбору 10,3 км². Схілы катлавіны выш. 2—6 м (на ПдУ да 20 м), разараныя. Берагі нізкія, пад хмызняком, у асобных месцах абразійныя. Мелкаводная зона пясчаная, глыбакаводная выслана глеямі. Зарастае. Паласа расліннасці ўздоўж берагоў да 20 м. На ПнЗ злучана пратокай з воз. Глодава.

ДО́ЎЖНА, возера ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрыса, за 22 км на ПдУ ад г.п. Расоны. Пл. 0,28 км², даўж. 2,4 км, найб. шыр. 240 м, даўж. берагавой лініі 4,8 км. Пл. вадазбору 3,9 км². Берагі высокія, на У зліваюцца са схіламі. На Пд выцякае ручай у р. Дрыса.

ДО́ЎЖЫНА, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Крашанка, за 6 км на Пд ад г.п. Ушачы. Пл. 0,65 км², даўж. 2 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 18 м, даўж. берагавой лініі больш за 5 км. Пл. вадазбору 14,3 км². Схілы

катлавіны выш. 20—26 м (на ПдЗ 7—15 м), пад хваёвым лесам. Берагі пад хмызняком, месцамі забалочаныя. Дно да глыб. 4—7 м высцілаюць пясчаныя адклады, глыбей — сапрапель і глеі. Шыр. паласы надводнай расліннасці да 25 м. На Пд у возера ўпадае ручай з воз. Баркоўшчына, на Пн выцякае ручай у воз. Вечалле. Уваходзіць у курортную зону Ушачы.

ДО́ЎНАР-ЗАПО́ЛЬСКІ Мітрафан Віктаравіч (14.6.1867, г. Рэчыца Гомельскай вобл. — 30.9.1934), бел. гісторык,

М.В.Доўнар-Запольскі.

эканаміст, этнограф, адзін з заснавальнікаў бел. нац. гістарыяграфіі. Скончыў Кіеўскі ун-т (1894). З 1899 прыват-дацэнт Маскоўскага, з 1902 праф., заг. кафедры Кіеўскага ун-таў. У 1907—17 дырэктар Кіеўскага камерцыйнага ін-та. З 1920 у Харкаве, Баку, з 1925 праф. БДУ, правадз. чл. Інбелкульта, старшыня яго гіст.-археагр. камісіі. З 1926 праф. Цімірязеўскай с.-г. акадэміі, правадз. чл. Інта гісторыі АН СССР. У 1929 у сувязі з уціскам імя Д.-З. ў справе «Платонава—Тарле», ідэалагічным наступам на «нацдэмаўшчыну» ў Беларусі, арыштам вядучых бел. вучоных ён не пазбег праследаванняў. Было заблакіравана выбранне Д.-З. акадэмікам АН СССР, асуджаны як ідэйна-заганны рукапіс яго кнігі «Гісторыя Беларусі», паскораны выхад на пенсію.

Першыя нарысы, прысвечаныя звычаёваму праву, зямельным адносінам, абрадам, вераванням, гіст. мінуламу Беларусі, пачаў публікаваць у канцы 1880-х г. У даследаванні «Беларускае мінулае» (1888) упершыню стварыў асн. ядро канцэпцыі гіст. развіцця бел. народа, паставіў праблему неабходнасці нац. адраджэння Беларусі. У 1891 выдаў манаграфію «Нарыс гісторыі Крывіцкіх і Дрыгавіцкіх земляў да канца XII стагоддзя», у 1899 — працу «В.М.Цяпінскі, перакладчык Евангелля на беларускую гаворку». Даследаваў сац.-эканам. адносіны ў ВКЛ 14—16 ст., дзярж. асновы літ.-бел. гаспадарства, гісторыю сялянства на Беларусі і ў Расіі (працы «Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах», 1901, «Нарысы па арганізацыі заходнярускага сялянства ў XVI ст.», 1905, «Старонка з гісторыі прыгоннага права ў XVIII—XIX стст.», 1906, «На зары сялянскай свабоды», 1911). Выдаў Баркулабаўскі летапіс, «Акты Літоўска-Рускай дзяржавы (XIV—XVI ст.)» (т. 2, вып. 1), «Дакументы Маскоўскага архіва Міністэрства юстыцыі» (т.1). Вывучаў грамадскую думку Расіі, дзекабрысцкі рух (працы «З гісторыі грамадскіх плыняў Расіі», 1905, «Палітычныя ідэалы М.М.Спяранскага», «Таемнае таварыства дзекабрыстаў», абедзве 1906, «Ідэалы дзекабрыстаў», 1907). Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 удзельнічаў у адбудове бел. дзяржаўнасці на дэмакр. асновах. У 1919 на бел. і асн. еўрап. мовах выдадзены нарыс Д.-З. «Асновы дзяржаўнасці Беларусі», у якім ён на падставе аналізу гіст., эканам. і этнагр. фактараў абгрунтаваў права бел. народа на суверэннасць. Апублікаваў манаграфію «Народная гаспадарка Беларусі, 1861—1914 гг.» (1926), раздзел «Беларуская ССР і Заходняя вобласць РСФСР» у кн. «Эканамічная геаграфія СССР» (1926), завяршыў абагульненую працу «Гісторыя Беларусі» (1926, выд. 1994), у якой разгледзеў шляхі, пройдзеныя бел. народам ад эпохі першабытнага ладу да пач. 1920-х г. У Рэчыцы Д.-З. пастаўлены помнік (1997).

Тв.: Белорусская свадьба и свадебные песни. Киев, 1888; Белорусское Полесье: Сб. этногр. материалов. Вып. 1. Киев, 1895; Спорные вопросы в истории Литовско-Русского сейма. СПб., 1901; Исследования и статьи. Т. 1. Киев, 1909; История русского народного хозяйства. Т. 1. Киев, 1911; Обзор новейшей русской истории. Т. 1—2. Киев, 1912—18.

Літ.: Даўгяла З.І. Літаратурныя працы доктара рускай гісторыі М.В.Доўнар-Запольскага ў храналагічным парадку за 45 год (1883—1928) // Зап. аддз. гуманіт. навук БАН. Мн., 1929. Кн. 8. Працы класа гісторыі, т. 3; Гануш А.Г., Кручок П.С. Мітрафан Доўнар-Запольскі. Мн., 1995; Михальченко С.И. Киевская школа в российской историографии (В.Б.Антонович, М.В.Довнар-Запольский и их ученики). М.; Брянск, 1997. *А.С.Ліс.*

ДО́ЎСАН (Dauson) Джордж Мерсер (1.8.1849, г. Пікту, Канада — 2.3.1901), канадскі географ і геолаг. Даследаваў раён вярхоўяў р. Фрэйзер (1878), выканаў геал. здымку рэк Бау і Белі (1880—82) і зах. ч. Скалістых гор (1882—84), а-воў Ванкувер і Каралевы Шарлоты. У 1887—88 узначальваў экспедыцыю па геолага-геагр. вывучэнні тэр. паўн.-зах. Канады. Яго імем названы горад у вусці р. Клондайк на ПнЗ Канады і горны хрыбет у вярхоўях р. Юкан.

ДО́ЎСК, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на скрыжаванні аўтадарог Рагачоў—Слаўгарад і Гомель—Магілёў. Цэнтр сельсавета і эксперым. базы «Доўск». За 31 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Рагачоў, 90 км ад Гомеля. 1893 ж., 769 двароў (1997). Гомельская абл. с.-г. доследная станцыя. Асфальтавы, цагельны, малочны з-ды, хлебазавод, філіял Рагачоўскага камбіната буд. матэрыялаў, аўтазаправачная станцыя. Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, 2 аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — царква (пач. 20 ст.).

ДО́ЎСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1935. Засн. 12 лютага. Цэнтр — мяст. Журавічы. Падзяляўся на 15 сельсаветаў. 5.4.1935 перайменаваны ў *Журавіцкі раён*.

ДО́ХА, горад, сталіца Катара, на У п-ва Катар. Каля 300 тыс. ж. (1994). Порт у Персідскім зал. Міжнар. аэрапорт. Гал. гандл. цэнтр краіны. Прам-сць: металаапр., цэм., харч., вытв-сць угнаенняў. Саматужныя промыслы. Рыбалоўства, здабыча жэмчугу. Ун-т. Арх. помнікі 18—20 ст.

ДО́ЦІШКІ, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл., каля аўтадарогі Радунь—Эйшышкес (Літва). Цэнтр сельсавета і с.-г. калект. прадпрыемства «Ніва». За 45 км на З ад Воранава, 108 км ад Гродна, 36 км ад чыг. ст. Бастуны. 660 ж., 198 двароў (1997). Базавая і муз. школы, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ДРА, Уэд-Дра, рака на ПнЗ Афрыкі, у Марока. Даўж. каля 1150 км, пл. бас. 15,1 тыс. км^2. Пачынаецца на паўд. схіле Высокага Атласа вытокамі Дадэ і Іміні, цячэ па зах. ускраіне Сахары. Упадае ў Атлантычны ак. толькі ў час паводкі, калі растаюць снягі ў гарах. Пастаяннае цячэнне ў гарах (каля 200 км), ніжэй воды ракі выкарыстоўваюцца на арашэнне. Даліна Д. густа населена.

ДРАБІ́ЛКА, машына для драблення кускавых матэрыялаў, пераважна мінер. сыравіны. Бываюць буйнога (для кавалкаў 1500—500 мм), сярэдняга (500—100 мм) і дробнага (100—40 мм) драблення; шчокавыя, конусныя, валковыя, ударныя і стрыжнёвыя (*дэзінтэгратары*).



Схема **драбілак**: *а* — шчокавая (1, 2 — рухомая і нерухомая шчокі); *б* — конусная (3, 4 — нерухомы і рухомы конусы); *в* — валковая зубчастая (5 — валкі); *г* — малатковая (6 — малаток, 7 — ротар); *д* — ротарная.

У шчокавых Д. матэрыял здрабняецца паміж 2 прамавугольнымі плітамі (шчокамі), адна з якіх хістаецца, а другая нерухомая, у конусных — паміж нерухомай чашай і конусам, што хістаецца і адначасова верціцца, у валковых — паміж 2 цыліндрычнымі валкамі (гладкімі або зубчастымі), якія верцяцца адзін насустрач аднаму, ва ўдарных — ад удараў малаткоў, што замацаваны на ротары шарнірна (у малатковых Д.) або нерухома (у ротарных). Выкарыстоўваюцца ў горнай, хім. і харч. прам-сці, металургіі, буд-ве, у сельскай гаспадарцы (гл. *Здрабняльнік кармоў*).

І.І.Леановіч.

ДРАБІ́НЫ, 1) сялянскія калёсы са здымнымі рашэцістымі бакавінамі. Гл. таксама *Мажара*. 2) Прыстаўная лесвіца.

ДРАБЛЕ́ННЕ яйца, сегментацыя яйца, рад паслядоўных дзяленняў аплодненага яйца, у выніку якіх утвараюцца больш дробныя клеткі (бластамеры); стадыя развіцця ўсіх шматклетачных жывёл. Пачынаецца пасля збліжэння мужч. і жан. клетак (гл. *Апладненне*) і аб'яднання іх храмасом. У некат. жывёл бывае Д. неаплодненых яец (гл. *Партэнагенез*). Іншы раз аплодненыя яйцы знаходзяцца ў стане спакою (гл. *Дыяпаўза*) і пачынаюць развівацца пры змяненні знешніх умоў (напр., т-ры навакольнага асяроддзя). У чалавека Д. прыводзіць да ўтварэння комплексу бластамераў — морулы.

ДРАБЛЕ́ННЕ ў тэхніцы, працэс разбурэння кавалкаў цвёрдых матэрыялаў у больш дробныя. Робіцца з дапамогай *драбілак*, звычайна камбінуецца з сартаваннем на *грохатах*. Найб. пашыраны мех. спосабы Д.: расціскванне, раскалванне, сціранне, удар, іх камбінацыі. Пры неабходнасці адзін і той жа спосаб можа выкарыстоўвацца некалькі разоў. Пры Д. атрымліваюць прадукты з памерам часціц больш за 5 мм (працэс атрымання больш дробных матэрыялаў наз. *здрабненнем* або памолам).



Спосабы **драблення**: 1 — расціскванне; 2 — раскалванне; 3 — сціранне; 4, 5 — удары.

ДРАБНАСО́ПАЧНІК, арыдна-дэнудацыйны тып рэльефу, які ўяўляе сабой узгоркі і групы ўзгоркаў (50—100 м адноснай вышыні), падзеленыя плоскімі катлавінамі і далінамі. Складзены пераважна з карэнных парод, вяршыні часта завостраныя, катлавіны з азёрамі. Утвараецца ў выніку разбурэння горных краін з неаднародным складам парод ва ўмовах кантынентальнага клімату (напр., *Казахскі драбнасопачнік, Мугаджары*).

ДРАБЯ́ЗКА Сцяпан Рыгоравіч (н. 7.8.1922, в. Уюнішча Чарнігаўскай вобл., Украіна), бел. юрыст. Д-р юрыд. н. (1970), праф. (1971). Засл. юрыст Рэспублікі Беларусь (1996). Скончыў Мінскі юрыд. ін-т (1949), з 1950 выкладчык гэтага ін-та. З 1955 у БДУ, з 1973 заг. кафедры тэорыі дзяржавы і права. Даследуе праблемы заканадаўства і фарміравання прававой дзяржавы.

Тв.: Комиссии Верховного Совета союзной республики. М., 1961; Формирование социалистического правового государства. Мн., 1990; Суверенитет права в социальном правовом государстве // Право и демократия. Мн., 1994. Вып. 6.

ДРА́ВА (Drava, ням. Drau), рака ў Аўстрыі, Славеніі, Харватыі, часткова з'яўляецца мяжой паміж Харватыяй і Венгрыяй; правы прыток р. Дунай. Даўж. 749 км, пл. бас. 40,4 тыс. км^2. Пачынаецца ў Карнійскіх Альпах, пераса-кае Клагенфурцкую катлавіну, прарываецца праз паўд. адгор'і Усх. Альпаў і цячэ па Сярэднедунайскай раўніне. Гал. прытокі — Гурк, Мура (злева), Гайль, Карашыца (справа). Сярэдні расход вады 610 м^3/с. Веснавое разводдзе, летне-асенняя паводкі. Каскад ГЭС. Суднаходная. На Д. — гарады Філах (Аўстрыя), Марыбар (Славенія), Вражджын, Осіек (Харватыя).



Схемы **драблення**: *а* — аднаступеньчаты цыкл; *б* — многаступеньчаты цыкл; 1 — матэрыял; 2 — грохат; 3 — буйныя фракцыі пасля грохата; 4 — конусная драбілка; 5 — фракцыі пасля драблення; 6 — дробныя фракцыі, адсартаваныя грохатам; 7 — шчокавая драбілка.

ДРАВІДЫ́ЙСКІЯ МО́ВЫ, дравідскія мовы, сям'я моў на тэр. Паўд.-Азіяцкага (Індыйскага) субкантынента. Пашыраны пераважна ў Індыі. Падзяляюцца на групы: паўд. (тамільская, малаялам, кота, тода, кодагу, каннара і канада), паўд.-зах. (тулу), паўд.-ўсх. (тэлугу), цэнтр. (коламі, найкі, парджы, гадаба), гандванскую (гондзі, конда, куі, куві, пенга, манда), паўн.-ўсх. (курух, малто) і паўн.-зах. (брагуі). Аднак генетычная класіфікацыя Д.м. канчаткова не распрацавана. Чатыры Д.м. (тамільская, малаялам, канада і тэлугу) маюць стараж. л-ру і лічацца афіц. мовамі інд. штатаў Тамілна, Керала, Майсур і Андхра-Прадэш. На тулу пісьменства з'явілася ў канцы 19 ст. Астатнія Д.м. беспісьменныя.

У фаналогіі Д.м. адрозніваюцца кароткія і доўгія галосныя, фанематычны націск адсутнічае. У марфалогіі пераважае суфіксальная аглюцінацыя. Назоўнік і інш. імёны маюць 2 лікі і да 11 склонаў; род мае лексіка-грамат. характар; прыметнікі нязменныя, ступень прыкметы перадаецца сінтаксічна. Колькасць формаў часу дзеяслова вагаецца ад 2 да 6. Сінтаксіс мае шмат агульных рыс з сінтаксісам цюркскіх, мангольскіх моў.

ДРА́ГА (англ. drag), плывучая ўстаноўка з абагачальным абсталяваннем, з дапамогай якой з-пад слою вады здабываюць карысныя выкапні. Спосабамі *абагачэння карысных выкапняў* з паднятага грунту вылучаюць каштоўныя металы і мінералы, пустую пароду ўкладваюць у адвал. Адрозніваюць Д.: кантынентальныя (манціруюцца звычайна на пантонах) і марскія (на самаходных або буксірных суднах); эл., дызель-эл. і дызельныя; адна- і шматчарпаковыя, гідра- і пнеўмаўсмоктвальныя. У шматчарпаковых Д. умяшчальнасць чарпака да 1500 л, глыбіня чэрпання да 50 м. Д. здабываюць золата, плаціну, алмазы, друз і інш.

ДРАГАМА́НАЎ Міхайла Пятровіч (30.9.1841, г. Гадзяч, Украіна — 2.7.1895), укр. філосаф, гісторык, эканаміст, літ.-знавец, фальклярыст, публіцыст, грамадскі дзеяч. Скончыў Кіеўскі ун-т (1863), дзе працаваў у 1864—75. З 1876 паліт. эмігрант у Швейцарыі, з 1889 праф. Сафійскага ун-та. У Жэневе з М.Паўлыкам і С.Падалінскім выдаваў час. «Громада», забароненыя ў Расіі творы Т.Шаўчэнкі, П.Мірнага і інш. Прапаведаваў культурна-нац. аўтаномію Украіны. У 1881 выдаў на бел. мове агітац. брашуру Падалінскага «Пра багацтва ды беднасць». Працы Д. па гісторыі Украіны: «Урывак з гісторыі ўкраінафільства» (1876), «Матэрыялы для маларускай гісторыі ў італьянскіх архівах»

(1877), «Погляд на ўкраінскую гісторыю» (1895) і інш. Як эканаміст быў на пазіцыях утапічнага сацыялізму. Прадстаўнік культурна-гіст. школы і параўнальна-гіст. метаду ў літ.-знаўстве («Літаратура расійская, велікаруская, украінская і галіцкая», 1873—74, «Шаўчэнка, украінафілы і сацыялізм», 1879, і інш.). Апублікаваў зб-кі ўкр. фальклору «Гістарычныя песні маларускага народа» (т. 1—2, 1874—75, з В.Б.Антановічам), «Палітычныя песні ўкраінскага народа 18—19 ст.» (1883—85) і інш. Прызнаваў права Беларусі на самаст. развіццё, асуджаў польск. і рус. палітыку дэнацыяналізацыі беларусаў («Вопыт украінскай палітыка-сацыяльнай праграмы», 1884, «Велікарускі інтэрнацыянал і польска-ўкраінскае пытанне», 1907). Паўлык і І.Франко пад уплывам Д. ў 1885 склалі праект «Украінска-польска-літоўска-беларускага брацтва». У 1886 перапісваўся з бел. пісьменнікам В.*Савіч-Заблоцкім*.

Тв.: Літературно-публіцистичні праці. Т. 1—2. Київ, 1970.

Літ.: Заславський Д., Романченко І. Михайло Драгоманов. Київ, 1964; Злупко С.М. М.П.Драгаманаў пра Беларусь і беларусаў // Матэрыялы першай навук. канф. па вывучэнню беларуска-ўкраінскіх літаратурных і фальклорных сувязей. Гомель, 1969; Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя. Мн., 1988. С. 312—319, 470—471.

В.А.Чабаненка.

ДРАГІЧЫН, горад, цэнтр Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. на аўтамагістралі Брэст—Пінск. За 110 км ад Брэста, 7 км ад чыг. ст. Драгічын на лініі Брэст—Гомель. 15,2 тыс. ж. (1997).

Упершыню ўпамінаецца ў 1452 як в. Давячоравічы. З 1623 мястэчка ВКЛ, у інвентары 1778 лічыўся горадам, з 1795 мястэчка Кобрынскага пав. У 1849 — 167 ж., 98 дамоў, у 1897 — 2258 ж., 280 дамоў, царк.-прыходская школа, 2 нар. вучылішчы, сельская лячэбніца. Напярэдадні 1-й сусв. вайны ў Д. 2 маслабойні, завод па ачыстцы мелу, ф-ка саламяных капелюшоў, 7 мукамольняў. З 1921 у Польшчы, цэнтр *Драгічынскага павета* Палескага ваяв., каля 4 тыс. ж. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 гар. пасёлак, цэнтр *Драгічынскага раёна*. З 25.6.1941 да 17.7.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Д. і раёне 4498 чал. У 1959 — 3,5 тыс. ж. З 10.11.1967 горад. У 1971 — 7,1 тыс. ж.

Трактарарамонтны і камбікормавы з-ды. Прадпрыемствы харч. прам-сці. Брацкія магілы сав. воінаў, сав. воінаў і партызан, магілы ахвяр фашызму, партызан і ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — царква Стрэчання (2-я пал. 19 ст.).

ДРАГІЧЫНСКАЯ БІТВА 1238, бітва паміж ням. рыцарамі і войскам галіцкавалынскага кн. *Данілы Раманавіча* Галіцкага ў г. Драгічын-Надбужскі (цяпер Польшча). У 1237 польскі кн. Конрад Мазавецкі перадаў раней заняты ім г. Драгічын Берасцейскай зямлі дабжынскім рыцарам на чале з магістрам Бруна. Тут пасялілася тая частка Дабжынскага ордэна, якая не ўвайшла ў 1235 у Тэўтонскі ордэн і захавала самастойнасць. Гэтым актам Конрад Мазавецкі спрабаваў замацавацца ў *Берасцейскай зямлі* і стварыць фарпост абароны ад Літвы. Вясной 1237 кн. Даніла Раманавіч рушыў на Драгічын, каб выбіць ням. рыцараў з падкантрольнай яму зямлі. З'явіўшыся пад горадам у сак. 1238, Даніла перамог дабжынцаў і захапіў у палон магістра Бруна. Вынікам перамогі стаў антыпольскі саюз, заключаны паміж Данілам Раманавічам і вял. князем ВКЛ *Міндоўгам*. У 2-й пал. 1238 ваяваць Мазовію хадзілі са сваім войскам Міндоўг і новагародскі кн. Ізяслаў. Конрад Мазавецкі адмовіўся ад тэр. дамаганняў да Галіцка-Валынскага княства.

Г.М.Сагановіч.

ДРАГІЧЫНСКІ ЕЗУІЦКІ КАЛЕГІУМ. Дзейнічаў у 1747—73 (у 1646—1747 рэзідэнцыя) у г. Драгічын-Надбужскі (цяпер у Беластоцкім ваяв., Польшча). Езуіцкі касцёл св. Тройцы пабудаваны ў 1709 (асвячоны біскупам у 1723), будынак калегіума — у 1746. Пры калегіуме існавалі канвікт (інтэрнат) для дзяцей збяднелай шляхты, муз. бурса, б-ка, школьны тэатр, аптэка (з 1737).

ДРАГІЧЫНСКІ ПАВЕТ. Існаваў у 1921—39 у Палескім ваяв. Польшчы. Падзяляўся на гміны. З 1939 у БССР, з 4.12.1939 у Пінскай вобл. Цэнтр — г.п. *Драгічын*. 15.1.1940 павет скасаваны, замест яго ўтвораны *Драгічынскі раён*.

ДРАГІЧЫНСКІ ПІЯРСКІ КАЛЕГІУМ, Драгічынскі піярскі ліцэй. Дзейнічаў у 1773—1834 у г. Драгічын-Надбужскі (цяпер у Беластоцкім ваяв., Польшча). Створаны на базе закрытага *Драгічынскага езуіцкага калегіума*, меў 3 класы. Уваходзіў у Піярскую навуч. акругу. У 1775 — 24 вучні, у 1782 — 90 вучняў. У 1795—1807 у складзе Прусіі, меў статус гімназіяльнага вучылішча. З 1807 у складзе Рас. імперыі. З 1812 павятовае вучылішча. У 1817 — 4 класы, 6 выкладчыкаў, 139 вучняў. Фінансаваўся ордэнам *піяраў* і дзяржавай. Выкладчыкі і вучні падтрымалі паўстанне 1830—31. 129 чал. не вярнулася з калядных вакацый 1830. У 1834 калегіум пераўтвораны ў свецкае павятовае вучылішча для дваран. Сярод выхаванцаў вучоны-славіст М.К.*Баброўскі*.

А.Ф.Самусік.

ДРАГІЧЫНСКІ РАЁН, на Пд Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940 (у сучасных межах з 1965). Пл. 1,9 тыс. км². Нас. 52 тыс. чал. (1997), гарадскога 34%. Сярэдняя шчыльнасць нас. 27 чал. на 1 км². Цэнтр раёна — г. *Драгічын*, г.п. *Антопаль*, 133 сельскія населеныя пункты. Падзяляецца на пассавет Антопальскі і 14 сельсаветаў: Асавецкі, Бездзежскі, Брашэвіцкі, Вулькаўскі, Галоўчыцкі, Гутаўскі, Дзеткавіцкі, Драгічынскі, Закозельскі, Імянінскі, Немяржанскі, Папінскі, Радастаўскі, Хомскі. У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС (1986)

Драга: 1 — шматчарпаковая (з чарпакамі па 210 л); 2 — грэйферная (схема).

Драгічын. Фрагмент забудовы.

22 населеныя пункты (1/6 тэр.) забруджаны радыенуклідамі.

Раён у межах водна-ледавіковай раўніны *Загароддзе*, на Пн — ч. *Прыпяцкага Палесся*, на Пд — у межах *Брэсцкага Палесся*. Паверхня плоскараўнінная, 85% тэр. з вышынямі да 165 м. Найвыш. пункт 173 м (на ПнУ ад в. Крамно). Карысныя выкапні: торф, легкаплаўкія гліны, буд. пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -4,9 °С, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 629 мм за год. Вегетац. перыяд 202 сут. На Пн раёна р. Ясельда з прытокамі Ласінцы, Плёса і інш., Дняпроўска-Бугскі канал, меліярац. каналы — Белаазерскі, Жыроўскі, Ляхавіцкі, Павіцкі і інш. У межах раёна вадасховішчы: Галоўчыцкае, Белін-Восаўцы і інш.; часткова



размешчаны азёры Спораўскае і Белае. Глебы: дзярнова-падзолістыя забалочаныя (37,6%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (34,5%), тарфяна-балотныя нізінныя (21,9%) і інш. Пад лесам 23% тэрыторыі. Найб. лясістасць на Пд; лясы хваёвыя, бярозавыя, чорнаальховыя і інш., чвэрць іх — штучныя насаджэнні. Балоты займаюць 15,8% тэр., 1/4 іх асушана. На тэр. раёна дзяржаўныя біялагічныя заказнікі Званец, Радастаўскі і часткова *Спораўскі*. Зоны адпачынку на р. Ясельда і Дняпроўска-Бугскім канале.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 96,9 тыс. га (51%), з іх асушана 41,9 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 22 калгасы, 1 саўгас, рыбгас «Навасёлкі», 23 фермерскія гаспадаркі. Асн. галіна сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля. Разводзяць авечак і свіней, займаюцца пчалярствам і рыбагадоўляй. Вырошчваюць збожжавыя культуры: жыта, пшаніцу, ячмень, авёс, грэчку, гарох, бульбу, цукр. буракі, лён. Прадпрыемствы харч. (сыр, хлеб, спірт), лёгкай (ватна-прадзільная ф-ка) прам-сці; вытв-сць буд. матэрыялаў, камбікорму, безалкагольных напіткаў, гематагену. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Брэст—Гомель, аўтадарогі Брэст—Гомель і Драгічын—Бяроза, Дняпроўска-Бугскі канал, нафтаправод «Дружба». У раёне 23 сярэднія, 15 базавых, 15 пач. школ, 4 муз. школы, санаторная школа-інтэрнат, дзіцяча-юнацкая спарт. школа, прафес.-тэхн. вучылішча, 14 дашкольных устаноў, 46 клубаў, 61 б-ка, 6 бальніц, 3 амбулаторыі, 27 фельч.-ак. пунктаў. Помнікі архітэктуры: касцёл (да 1820) і Троіцкая царква (1784) у в. Бездзеж; царква Ушэсця (пач. 20 ст.) у в. Брашэвічы; царква Раства Багародзіцы (1737) у в. Вавулічы; Міхайлаўская царква (1780) у в. Восаўцы; Юр'еўская царква (1766) у в. Валавель; Пакроўская царква (1740) у в. Дзеткавічы; сядзіба Э.Ажэшка з капліцай-пахавальняй (1853) у в. Закозель (19 ст.); Троіцкая царква (1842) у в. Зёлава; Успенскія цэрквы ў в. Ласінцы (пач. 19 ст.) і ў в. Ліпнікі (1792); руіны сядзібы, дзе жыла Э.Ажэшка ў в. Людзвінова; царква Багародзіцы (19 ст.) у в. Ляхавічы; касцёл (19 ст.) у в. Новае Папіна; сядзіба (пач. 19 ст.) у в. Пяркавічы; Праабражэнская царква (1810) у в. Папіна; Пакроўская царква (1862) у в. Радастава; царква Раства Багародзіцы (1797) у в. Субаты; Святадухаў касцёл (1750) у в. Язвіны. Выдаецца газ. «Драгічынскі веснік». *Г.С.Смалякоў.*

ДРАГІЧЫНСКІ СВЯТА-ТРОІЦКІ МАНАСТЫР. Існаваў з 16 ст. да 1824 у г. Драгічын-Надбужскі (цяпер Беластоцкае ваяв., Польшча). Засн. на Крамчэўскай гары пры царкве св. Тройцы, вядомай з 1494. У 1563 кароль польскі і вял. князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст даў манахам 2 валокі ворыўнай зямлі, 8 маргоў агародаў, дзесяціну з в. Сяневічы і Хралавічы, дазволіў штогадовы кірмаш на Сёмуху каля Крамчэўскай гары. Апекавала манастыр навакольная правасл. шляхта. Пасля *Брэсцкай уніі 1596* манастыр неаднаразова зачыняўся мясц. ўладамі, былі спробы перавесці яго на уніяцтва. У 1659 зноў адчынены. Правасл. статус манастыра і ўсе яго ранейшыя прывілеі пацверджаны каралямі Янам Казімірам (1661), Янам III Сабескім (1695) і Аўгустам II (1698). У 1769 разрабаваны войскамі *Барскай канфедэрацыі*, адноўлены на сродкі Кіеўскай мітраполіі. У 1824 закрыты. *М.Р.Гайдук.*

ДРАГЛАЙН (англ. dragline), аднакаўшовы *экскаватар* з гнуткай канатнай сувяззю стралы і каўша. Аб-



Схема **драглайна**: 1 — коўш; 2 — страла; 3 — паваротная платформа з рухавіком.

сталёўваецца звычайна шагаючым ходам. Даўж. стралы да 100 м, ёмістасць каўша да 80 м³. Выкарыстоўваецца для здабычы карысных выкапняў адкрытым спосабам (у кар'ерах), у гідратэхн. і меліярац. буд-ве. Д. наз. таксама яго рабочае абсталяванне.

ДРАГО́БЫЧ, горад на Украіне, цэнтр раёна ў Львоўскай вобл., на р. Тысменіца (бас. Днястра), у перадгор'і Карпат. Вядомы з 11 ст. 79 тыс. ж. (1991). Чыг. вузел. Прам-сць: нафтаперапр., горнахім., машынабуд. і металаапр., дрэваапр., харч., швейная. Турызм. Пед. ін-т, агульнатэхн. ф-т Львоўскага політэхн. ін-та. Тэатр, краязнаўчы музей. Крапасная вежа раманскага стылю (канец 13 — пач. 14 ст.), гатычны касцёл 15 ст., 2 драўляныя царквы (16, 17 ст.).

ДРАГО́Й, Дрэгой (Dragoi, Drăgoi) Сабін (18.6.1894, г. Сэліштэ, Румынія — 31.12.1968), румынскі кампазітар, фалькларыст. Засл. дз. маст. Румыніі (1953). Чл.-кар. Акадэміі Румыніі (1953). Вучыўся ў Клужскай (1919—20), удасканальваўся ў Пражскай (1920—22) кансерваторыях. Праф. кансерваторый у Тымішаары (1924—42 і 1946—50, у 1925—43 таксама дырэктар) і Бухарэсце (1950—52). Дырэктар Опернага т-ра ў Тымішаары (1940—47), Ін-та фальклору ў Бухарэсце (1950—64). У творчасці арыентаваўся на рум. сял. песні. Сярод твораў: оперы «Напасць» (паст. 1928), «Пэкалэ» (паст. 1962); араторыі, кантаты; «Сельскі дывертысмент» для стр. аркестра (1928), канцэрт для фп. з аркестрам (1941); хар. творы, музыка да кінафільмаў. Відны даследчык рум. фальклору (запісаў каля 3000 нар. мелодый). Аўтар апрацовак нар. мелодый для фп. і голасу з фп., зборнікаў нар. песень (калядкі, дойны), артыкулаў. Дзярж. прэміі Румыніі 1950, 1952.

ДРАГУ́Н Уладзімір Леанідавіч (н. 21.9.1946, Мінск), бел. вучоны ў галіне цеплафізікі. Д-р тэхн. н. (1994), праф. (1996). Скончыў БДУ (1968). З 1968 у Акадэмічным навук. комплексе «Ін-т цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава». Навук. працы па бескантактнай дыягностыцы цеплавых працэсаў і з'яў у капілярна-сітаватых целах, гетэрагенных сістэмах, біяаб'ектах (для мэт мед. дыягностыкі). Распрацаваў прынцыпы і навук.-тэхн. асновы выліч. тэрмаграфіі.

Тв.: В мире тепла. Мн., 1991 (разам з С.У.Коневым); Вычислительная термография: Применение в медицине. Мн., 1992 (разам з С.А.Філатавым).

ДРАГУ́Н Фёдар Міхайлавіч (н. 21.12.1962, Мінск), бел. мастак-манументаліст. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1989). Працуе ў БПА з 1994. Асн. творы: вітражы ў бібліятэцы імя А.С.Пушкіна ў Мінску (1990—91), у зале Нар. адраджэння ў Горацкай гімназіі (1993), у Рэсп. медыка-генетычным цэнтры («Сонца на зямлі», 1994), у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (1995), у Доме культуры г. Івацэвічы (1995). Сярод жывапіс-

ных твораў «Купальская ноч» (1992), «Поле ўдоў» (1993), «Дзікая ягада» і «Зорка Венера» (абодва 1994), «Летуценні» (1996) і інш. *А.Б.Александровіч.*

ДРАГУ́НЫ (франц. dragon, адз. л.), від кавалерыі, здольнай дзейнічаць у пешым страі. З'явіліся ў 16 ст. ў Францыі (пасаджаныя на коней пехацінцы, якія спешваліся пры сустрэчы з праціўнікам). З 17 ст. драгунскія палкі існавалі ў Германіі, Польшчы, Беларусі (у складзе войска ВКЛ, да канца 18 ст.), Расіі (1631 — пач. 1918), у 18—20 ст. — у большасці еўрап. армій (належалі да цяжкай або сярэдняй кавалерыі, складалі $^1/_3$ усёй конніцы). У розны час мелі на ўзбраенні пісталеты, мушкеты, фузеі, карабіны, вінтоўкі, шаблі, палашы, шашкі.

Ф.Драгун. Зорка Венера. 1994.

Літ.: Саганович Г.М. Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI—XVII стст. Мн., 1994; Грыгор'еў М. Войска ВКЛ: Ад Сасаў да Касьцюшкі, 1765—1794. Мн., 1994.

ДРАЖДЖАВА́Я ВЫТВО́РЧАСЦЬ, вытворчасць пякарскіх *драждзэй* роду Saccharomyces cerevisiae, якія выкарыстоўваюць у хлебапячэнні і мед. прамысл. Сыравіна для Д.в. — адходы цукр. вытв-сці (мелес), вугляводы мелесу ў прысутнасці кісларoду і азоцістых рэчываў у выніку біяхім. працэсаў ператвараюцца ў клетачную біямасу. У заводскіх умовах выхад біямасы дражджэй складае 70—90% у адносінах да масы мелесу.

Таварныя дрожджы вырошчваюць у дрожджавырошчвальных апаратах у водным растворы мелесу пры аэрацыі. Перад падачай у вытв-сць мелес асвятляюць на сепаратарах-асветчальніках (для выдалення прымесей), разбаўляюць вадой, дабаўляюць мінер. пажыўныя кампаненты, што маюць азот і фосфар (напр., сульфат амонію, дыамонійфасфат і інш.), сумесь мікраэлементаў, кукурузны экстракт (крыніца роставых рэчываў) і матачную дрожджы з чыстых культур для размнажэння. Дрожджы са зброджанага сусла выдаляюць на сепаратарах-раздзяляльніках у выглядзе густога дражджавога малака, з якога фільтр-прэсамі ці вакуум-фільтрамі выдаляюць вільгаць. На аўтам. лініях ажыццяўляюць фармаванне і расфасоўку прасаваных дражджэй у брыкеты (т-ра захоўвання 1—4 °С). З прасаваных дражджэй высушваннем пры т-ры да 70 °С атрымліваюць сухія дрожджы (т-ра захоўвання 15 °С). *М.В.Грыц.*

Да арт. **Драгуны**. Маёр конна-гвардзейскага (драгунскага) палка ВКЛ у мундзіры ўзору 1792, узброены гвардзейскім палашом.

ДРА́ЖНА, вёска ў Старадарожскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 18 км на Пн ад горада і чыг. ст. Старыя Дарогі, 130 км ад Мінска, 459 ж., 216 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ДРАЖНІ́ЛКІ, кароткія, найчасцей аднастрофныя вершаваныя творы сатыр. характару; жанр *дзіцячага фальклору*. У іх жартам высмейваецца «супраціўнік», яго імя, знешні выгляд, рысы характару (часам скіраваны на птушак і звяроў). Маюць генет. сувязь з даўняй традыцыяй мянушак, уласцівым фальклору нар. гумарам. Д. выразна функцыянальныя, што вызначае іх сэнс і форму. Характэрныя іх кампаненты — рэчытатыўнае скандаванне, выразны рытм, яркая рыфма, шматразовае паўтарэнне. Д. ўласцівы перавелічэнні, літота, насычанасць параўнаннямі, ужыванне дадаткаў-азначэнняў.

Публ.: Дзіцячы фальклор. Мн., 1972.

Літ.: Барташэвіч Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мн., 1976. С. 111—122.

ДРАЖЭ́ (франц. dragée), 1) дробныя круглыя цукеркі з гладкай бліскучай паверхняй, часам з начынкай. 2) Пашыраная форма дазіравання вітамінаў, лекаў.

ДРАЗАФІ́ЛЫ (Drosophila), род насякомых сям. пладовых мушак атр. двухкрылых. Больш за 1000 відаў. Пашыраны ўсюды, больш шматлікія ў тропіках і субтропіках (напр., на Гавайскіх а-вах больш за 300 відаў). Трапляюцца на кветках, часта на дрэвавых соках, вінных і фруктовых з-дах, у памяшканнях для агародніны і садавіны. Найб. вядомая Д. звычайная, або пладовая мушка (D. melanogaster). На Беларусі каля 30 відаў.

Дразафіла звычайная.

Даўж. да 3,5 мм. Цела стракатае, галава жоўтая, вочы чырвоныя. Жывяцца сокам раслін, прадуктамі гніення агародніны і садавіны. Лёгка разводзяцца ў лабараторных умовах, аб'ект генет. даследаванняў.

ДРАЗДО́ВА Лілія Сцяпанаўна (н. 12.6.1927, г. Байрам-Алі, Туркменія), бел. і рус. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1953), нар. арт. Расіі (1971). Скончыла Бел. тэатр. ін-т (1950). Працавала ў Бел. т-ры імя Я.Купалы. Выконвала ролі маладых гераінь. Яе знешнія даныя, сцэн. абаяльнасць, мяккасць, творчая індывідуальнасць спрыялі ўвасабленню на бел. сцэне нац. характару: Алена («Салавей» З.Бядулі), Дуня («Простая дзяўчына» К.Губарэвіча), Насця («Пяюць жаваранкі» К.Крапівы, Дзярж. прэмія СССР 1952; і ў фільме-спектаклі). З інш. роляў: Таня («Таня» А.Арбузава), Галя («У добры час!» В.Розава), Ніна Зарэчная («Чайка» А.Чэхава). Знялася ў фільмах-спектаклях «Паўлінка», «Несцерка», «Хто смяецца апошнім». З 1957 у Ніжагародскім драм. т-ры імя М.Горкага.

ДРАЗДО́ВА Маргарыта Сяргееўна (н. 7.5.1948, Масква), руская артыстка балета. Нар. арт. Расіі (1980). Нар. арт. СССР (1986). Скончыла Маскоўскае харэаграфічнае вучылішча (1967), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1988). У 1967—87 салістка Маскоўскага муз. т-ра імя К.Станіслаўскага і У.Неміровіча-Данчанкі. Сярод партый: Адэта—Адылія («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Папялушка («Папялушка» С.Пракоф'ева), Гаянэ («Гаянэ» А.Хачатурана), Флёр дэ Ліс («Эсмеральда» Ц.Пуні), Медора («Карсар» А.Адана), Сванільда («Капелія» Л.Дэліба). Яе творчасці ўласцівы віртуознае валоданне тэхнікай класічнага танца, элевацыя, драм. выразнасць. Лаўрэат міжнар. конкурсаў артыстаў балета ў Варне (1972, Балгарыя) і Маскве (1973). Прэмія імя Г.Паўлавай (Парыж, 1968). Дзярж. прэмія Расіі 1980.

ДРАЗДО́ВІЧ Вікенцій Іосіфавіч (15.8.1911, в. Навасёлкі Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 3.12.1942), удзельнік партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). З жн. 1941 ствараў падп. арг-цыі на радзіме. З ліп. 1942 камандзір узвода ў атрадзе імя Катоўскага партыз. брыгады імя К.Я.Варашылава Мінскай вобл. У час карнай экспедыцыі гітлераўцаў супраць партызан у Капыльскім р-не Д. узначаліў партыз. засаду каля в. Клецішча. 18 партызан на працягу 4 гадзін адбілі 8 атак фаш. батальёна, сарвалі намер ворага нанесці раптоўны ўдар па партыз. брыгадзе, аднак былі акружаны і ўсе загінулі ў баі (гл. *Лаўскі бой 1942*). У в. Навасёлкі Д. пастаўлены помнік.

ДРАЗДО́ВІЧ Язэп Нарцызавіч (13.10.1888, б. засценак Пунькі, Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. — 15.8.1954), бел. мастак, скульптар, этнограф, фалькларыст, археолаг, пісьменнік. Адзін з заснавальнікаў нац. гіст. жывапісу. Скончыў Віленскую школу рысавання (1908). Выкладаў маляванне ў бел. школах. Заснавальнік маст. студыі пры Віленскай бел. гімназіі (1927). Прадстаўнік рамант. кірунку ў бел. мастацтве. У пейзажах (графічная серыя «Старажытная будоўля на Беларусі»,

В.І.**Драздовіч**.

Я.Н.**Драздовіч**.

1910 — пач. 20-х г.), «Вёска Стадолішча», 1919), тэматычных кампазіцыях «Усяслаў Чарадзей у парубе пад палатамі кіеўскага князя» (1923), «Усяслаў Чарадзей пад Гародняй», «Песня Баяна» (1940-я г.), партрэтах Ф.Багушэвіча, Я.Пачопкі, полацкіх і смаленскіх князёў асн. ўвагу аддае адлюстраванню праз паэтызаваныя, сімвалічныя вобразы стараж. бел. гісторыі. Шэраг работ прысвечаны Ф.Скарыне («Францыск Скарына. Развітанне з родным Полацкам, або У свет па навуку», «Са свету з навукай», «Друкарня Францішка Скарыны ў Вільні ў 1525 годзе» (1927 — 1-я пал. 40-х г.). У 2-й пал. 1920-х г. стварыў графічныя серыі, прысвечаныя стараж. замкавай архітэктуры Беларусі і Літвы («Мір», «Крэва», «Ліда» і інш.). Этнаграфічнае і гіст.-краязнаўчае значэнне маюць замалёўкі сял. тыпажоў, узораў нар. дойлідства, прылад працы і прадметаў побыту, адзення. Асобную групу складаюць творы з сімволіка-алегарычнымі вобразамі («Мужык з панам цягаецца», 1935, «Пагоня», 1927, «Дух цемры», 1932, і інш.). Касмічная тэма прадстаўлена серыямі «Жыццё на Марсе» (1931), «Жыццё на Сатурне» і «Жыццё на Месяцы» (абедзве 1932), творамі «Пейзаж» (1930-я г.), «Трывень» (1932—33), «Космас» (1940), «Артаполіс» (1934—35) і інш., у якіх спалучаецца гуманіст. зямны пачатак з наіўным бачаннем ірэальнага. Прымаў удзел у афармленні час. «Саха» (1912—15), «Рунь» (1920) і інш., кніг «Беларускі каляндар на 1910 год», «Курганная кветка» К.Буйло (1914), «Школьны спеўнік» А.Грыневіча (1920), «Леманар» (1919), уласнай кнігі «Вар'ят без вар'яцтва, або Вялікая шышка» (1923, псеўд. Я.Нарцызаў), брашуры «Нябесныя бегі» (1931). Маляваў насценныя дываны. У аснову іх кампазіцыі паклаў раслінныя, зааморфныя, арх.-сюжэтныя матывы. Стварыў партрэты-барэльефы А.Грыневіча, Я.Пачопкі, М.Машары, маці (пач. 1930-х г.), бюст Ф.Скарыны, «Плач Гарыславы» (1920-я г.). Працаваў у галіне плаката. Запісваў фальклор і апрацоўваў для слоўнікаў нар. лексіку Дзісеншчыны і Піншчыны. Праводзіў археал. даследаванні, вёў археал. дзённікі «Дзісенская дагістарычная старына». У Мінску помнік Д., яго імем названы Германовіцкі музей мастацтва і

Я.Драздовіч. Пейзаж. 1930-я г.

Я.Драздовіч. Космас. 1940.

этнаграфіі (Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл.).

Тв.: Дзённік // Маладосць. 1991. № 5—12.

Літ.: Ліс А.С. Вечны вандроўнік. Мн., 1984; Язэп Драздовіч: [Фотаальбом] // Аўтар тэксту Т.В.Габрусь. Мн., 1993; Язэп Дроздович: «Меня еще поищут...» // Нёман. 1997. № 1. *М.Л.Цыбульскі.*

ДРАЗДО́ВЫЯ (Turdidae), сямейства пеўчых птушак атр. вераб'інападобных. 50—55 родаў, каля 300 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды і халодных раёнаў Арктыкі. Жыхары лясоў, зараснікаў, кустоў, абрываў і скал. У Чырв. кнізе МСАП 4 віды і 8 падвідаў. На Беларусі 14 відаў з 6 родаў: *гарыхвосткі*, дразды (Turdus), заранкі (Erithacus), каменкі (Oenanthe), салаўі (Luscinia), чаканы (Saxicola).

Даўж. 12—40 см, маса 13—200 г. Вонкавы выгляд і афарбоўка дарослых птушак разнастайныя. Птушаняты плямістыя. Ногі ў большасці моцныя, пярэдні бок цэўкі ўкрыты 1 шчытком. Дзюба моцная, але тонкая. Хвост у большасці прамы. Ва ўмераных шыротах Д.— пералётныя птушкі. Гняздуюцца на дрэвах, кустах, зямлі, у дуплах і інш. Нясуць 2—6 яец. Гадуюць за год 1—2 патомствы. Корміцца насякомымі, восенню і зімой — ягадамі, насеннем. Многія Д. добра спяваюць.

ДРАЗДО́Ў Вадзім Аляксандравіч (н. 12.2.1930, г. Цвер, Расія), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1974), праф. (1976). Скончыў Маскоўскі фін. ін-т (1953). З 1963 у Бел. эканам. ун-це. Даследуе тэарэт. праблемы грашовага абарачэння, крэдыту і фінансаў у рыначнай эканоміцы.

Тв.: Денежное обращение и кредит капиталистических стран. М., 1977 (у сааўт.).

ДРАЗДО́ЎСКАЯ Петранела Аляксандра (1761 ці 1767 — 4.11.1812), драматычная актрыса і спявачка. Працавала ў прыдворным т-ры М.К.Агінскага ў Слоніме (у 1780 выступала ў оперы «Тэлемак»), са студз. 1783 у прыдворным т-ры К.Радзівіла Пане Каханку ў Нясвіжы. У 1784 у п'есе «Святкі» дэбютавала ў трупе В.Багуслаўскага ў Гродне, пазней працавала з яго тэатрам і ў інш. антрэпрызах (Варшава, Гродна, Львоў і інш.).

ДРАЗДО́ЎСКІЯ, польскія, бел. і рускія акцёры 19 ст., бацька і дачка.

Войцех (?—1850), камедыйны акцёр, рэжысёр і антрэпрэнёр. З 1840 працаваў у Мінску (трупа Я.Хелмікоўскага), у 1842 выступаў у Гродне ў трупе пад кіраўніцтвам Шмідкафа; іграў на польскай і рус. мовах. З 1847 трымаў уласную антрэпрызу (працавала пераважна ў Мінску), дзе ў 1848—50 паставіў больш за 40 п'ес, у т.л. ўпершыню на Беларусі камедыі «Рэвізор» і «Жаніцьба» М.Гогаля, таксама п'есы Р.Квіткі-Аснаўяненкі, П.Каратыгіна, Ф.Коні, П.Грыгор'ева. У рэпертуары яго трупы былі оперы («Аскольдава магіла» А.Вярстоўскага, «Сарока-злодзейка» Дж.Расіні), муз.-драм. творы («Наталка-Палтаўка» І.Катлярэўскага), аперэты і вадэвілі.

Марыя (?—?), драм. актрыса і спявачка (мецца-сапрана). У 1847—63 выступала ў Мінску. Выконваўца вадэвільнага рэпертуару. Для яе кампазітар Ф.Міладоўскі напісаў аперэту «Канкурэнты» (тэкст М.Лапіцкага і У.Сыракомлі). У канцэртным рэпертуары актрысы творы А.Варламава, М.Глінкі, нар. песні. *Г.І.Барышаў.*

ДРАЗДЫ́, вёска ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., на левым беразе р. Зах. Дзвіна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 4 км на ПнУ ад Бешанковіч, 55 км ад Віцебска, 36 км ад чыг. ст. Чашнікі. 309 ж., 124 двары (1997). Пачатковая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.



Я.Драздовіч. Вёска Стадолішча. 1919. Пяро, туш.

ДРАЗДЫ́, вадасховішча на паўн.-зах. ускраіне Мінска, у складзе *Вілейска-Мінскай воднай сістэмы*. Створана ў 1976. Пл. 2,4 км^2, даўж. 6 км, найб. шыр. 600 м, найб. глыб. 5,5 м, аб'ём вады 6,17 млн. м^3. Катлавіна вадасховішча — забалочаная пойма р. Свіслач. Берагі нізкія, плаўна зліваюцца са схіламі. Дно пясчанае. 2 астравы (пл. 0,05 км^2). Выкарыстоўваецца для водазабеспячэння і воднага добраўпарадкавання горада. На берагах Д. санаторыі, лагеры адпачынку, лодачная станцыя, пляжная зона. Паміж вадасх. Заслаўскае і Дразды пабудаваны канал воднага слалама. Арніталагічны заказнік Лебядзіны. *Г.С.Жукоўская.*

Т.Драйзер.

ДРА́ЙЗЕР (Dreiser) Тэадор (27.8.1871, г. Тэрэ-Хот, ЗША — 28.12.1945), амерыканскі пісьменнік. У 1888—89 вучыўся ва ун-це г. Блумінгтан. З 1892 пачаў працаваць журналістам, у 1897 апублікаваў першыя нарысы і апавяданні. Найб. вядомасць яму прынеслі раманы «Сястра Керы» (1900), «Джэні Герхарт» (1911), «Трылогія жадання» («Фінансіст», 1912; «Тытан», 1914; «Стоік», 1947, незак.), «Геній» (1915), «Амерыканская трагедыя» (1925). Аўтар зб-каў апавяд. «Вызваленне» і іншыя апавяданні (1918), «Дванаццаць мужчын» (1919), «Фарбы вялікага горада» (1923), кн. публіцыстыкі «Драйзер глядзіць на Расію» (1928; нап. пад уражаннем паездкі ў Расію ў 1927—28), «Трагічная Амерыка» (1931), «Амерыку варта рата-

Вадасховішча Дразды.

ваць» (1941). Адыграў вял. ролю ў развіцці рэалізму ў амерыканскай л-ры. Надаў новае гучанне надзвычай распаўсюджанай у л-ры ЗША тэме «амерыканскай мары»: паказаў яе адваротны бок — «амерыканскую трагедыю», раскрыў механізм уздзеяння грамадства на псіхалогію і лёс як звычайнага чалавека, так і асобы адоранай; паказаў будзённасць і шматлікасць трагедый, выкліканых імкненнем людзей любымі сродкамі дасягнуць поспеху, зрабіць кар'еру. Пасля смерці пісьменніка выйшлі раман «Апірышча» (1946) і яго лісты (т. 1—3, 1959).

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—12. М., 1973.

Літ.: Засурский Я.Н. Теодор Драйзер. М., 1977. *Е.А.Лявонава.*

ДРАЙ-ХМА́РА Міхайла (сапр. Драй Міхайла Панасавіч; 10.10.1889, с. Малыя Каніўцы Чаркаскай вобл., Украіна — 19.1.1939), укр. паэт, перакладчык, літ.-знавец. Скончыў Кіеўскі ун-т (1913), дзе ў 1926—33 быў прафесарам. У 1935 рэпрэсіраваны. Загінуў на Калыме. Аўтар зб. вершаў «Прорасць» (1926), манаграфіі «Леся Українка» (1926), даследаванняў па гісторыі ўкр., серб., польск., бел. л-р. Пераклаў на ўкр. мову вершы і паэмы А.Пушкіна, М.Лермантава, А.Міцкевіча, П.Верлена, Ш.Бадлера, карэла-фінскі эпас «Калевала» і інш., зб. М.Багдановіча «Вянок» (1929). Аўтар арт. «Паэт беларускага адраджэння Максім Багдановіч» (1928), «Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча» (1929), «Фрагменты Мінскага пергаментнага апракаса XIV ст.» (1931).

Тв.: Вибране. Київ, 1989.

Літ.: Рагойша В. І нясе яна дар... Мн., 1977. С. 141—146. *В.А.Чабаненка.*

ДРАКАНІ́ДЫ, *метэорны паток* з радыянтам у сузор'і *Дракона*, звязаны з кометай Джакабіні-Цынера. Назіраецца штогод 9—10 кастрычніка. У 1933 і 1946 Д. далі асабліва вял. метэорныя дажджы.

ДРАКАНІ́ЧНЫ ГОД, гл. ў арт. *Год.*

ДРАКАХРУ́СТ Аляксандр Абрамавіч (н. 7.11.1923, Масква), рускі паэт. Скончыў Маскоўскае ваен.-інжынернае вучылішча (1945) і Хабараўскі пед. ін-т (1962). Служыў у арміі (1941—71). Друкуецца з 1939. Першы зб. вершаў «Міру быць на зямлі» (1951). На рус. мову пераклаў асобныя творы Р.Барадуліна, А.Вялюгіна, С.Гаўрусёва, С.Грахоўскага, Е.Лось, У.Паўлава, П.Прыходзькі, А.Русецкага, Ю.Свіркі і інш.

Тв.: Мои вы годы-эшелоны...: Избранное. Мн., 1975; Дальняя связь: Избранное. Мн., 1983; Сквозное ранение. Мн., 1984; Круговорот. Мн., 1986; Исповедь. Мн., 1990.

ДРАКО́Н, у міфалогіі многіх народаў крылаты (часам шматгаловы) вогненны змей, тулава якога складалася з частак цела змяі, кракадзіла, птушкі, рыбы, льва, сабакі і інш. У краінах Усх. Азіі лічыўся бажаством вады, якое прыносіць урадлівасць, пазней — сімвал улады. Д. былі пераможаны *Гераклам* (*Підра*, Ладон), *Апалонам* (*Піфон*, Тыфон), Георгіем Пераможцам і інш.

ДРАКО́Н (лац. Draco), каляпалярнае сузор'е Паўн. паўшар'я неба. Мае 80 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні. Ламаны ланцужок слабых зорак Д. агінае сузор'е *Малая Мядзведзіца* і заканчваецца больш яркай зоркай γ (2-й візуальнай зорнай велічыні), назіраючы за якою англ. астраном Дж.Брадлей адкрыў (1725) *аберацыю святла*. Адна з зорак Д. — Тубан каля 2,5 тыс. гадоў назад была і праз 20 тыс. гадоў зноў будзе «Палярнай» зоркай. У Д. знаходзіцца яркая планетарная туманнасць 8-й зорнай велічыні, якая пашыраецца. З тэр. Беларусі Д. відаць круглы год.



Сузор'е **Дракон**.

Шматгадовая дрэвападобная расліна выш. больш за 20 м, дыям. ствала каля асновы да 4 м. Характэрны другасны рост у таўшчыню. Лісце доўгае, скурыстае, шорсткае, размешчана пучкамі на канцах галінак. Кветкі буйныя, двухполыя, сабраны ў пучкі па 2—4. Тэхн., лек. і дэкар. расліна. З надрэзаў кары выцякае чырв. смала (т. зв. «драконава кроў»), з якой атрымліваюць лак. Валокны лістоў выкарыстоўваюць для пляцення. Д.д. называюць таксама некаторыя інш. віды драцэны (напр., амбет, ці афрыканскае Д.д., кінаварна-чырвоная, камбаджыйская, расколатае ці самалійскае Д.д.), якія выдзяляюць крывава-чырвоную смалу. *Г.У.Вынаеў.*

ДРАКО́НАВЫ ГО́РЫ (афрыкаанс Drakensberg), у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, на ПдУ Афрыкі, ч. *Уступу Вялікага*. Працягласць каля 900 км. Найвыш. вяршыня Д.г. і Паўд. Афрыкі г. Тхабана-Нтленьяна (3482 м); перавальжаюць вышыні 2000—3000 м. Складзены з пясчанікаў і сланцаў сістэмы Кару (ад верхняга карбону да верхняга трыясу — ніжняй юры) і базальтаў, вылітанне якіх адбылося ў пач. мезазойскай эры. Гарызантальнае заляганне адкладаў Кару абумовіла сплошчаныя вяршыні гор, расчлянёныя эрозіяй на стромкія схілавыя плато. З'яўляюцца водападзелам паміж рэкамі Індыйскага ак., якія праразаюць усх. стромкі схіл, і вярхоўямі р. Аранжавай. Клімат і расліннасць усх. і зах. схілаў рэзка адрозніваюцца. На ўсх. вільготных да 1200 м трапічныя дажджавыя лясы, вышэй ліственвыя і хвойныя лясы, калючыя хмызняковыя зараснікі, горныя лугі і каменныя россыпы. На сухіх зах. схілах лясы саступаюць месца саваннам і хмызнякам.

ДРАКО́НАВА ДРЭ́ВА (Dracaena draco), кветкавая расліна з роду *драцэна*. Эндэмік Канарскіх а-воў.

Драконава дрэва.

ДРАКО́НТ, Дракон (грэч. Drakōn), старажытны афінскі заканадавец, *архонт*. Пры ім у 621 да н.э. на каменных плітах запісаны прававыя звычаі. Паводле законаў Д. скасоўвалася права радавой арыстакратыі на кроўную помсту,

карныя функцыі перадаваліся *арэапагу*. Разам з тым прадугледжваліся вельмі жорсткія пакаранні для тых, хто спакушаўся на чужую ўласнасць (напр., пакаранне смерцю за крадзеж зерня, агародніны). У 594 да н.э. крымінальныя нормы заканадаўства Д. змякчыў *Салон*. Выразы «драконаўскія законы», «драконаўскія меры» захаваліся ў прымаўках і азначаюць жорсткія мерапрыемствы.

ДРАКО́НЫ (Draco), род яшчарак сям. агам. 22 віды. Пашыраны ў Паўд.-Усх. Азіі. Жывуць пераважна ў кронах дрэў.

Даўж. да 40 см. Тулава ярка і страката афарбаванае. Па баках цела шырокія скурныя складкі, якія падтрымліваюцца 5—7 несапраўднымі рэбрамі. Складкі здольны распасцірацца ў выглядзе крылаў, таму Д. могуць планіраваць на адлегласць да 30 м і на ляту мяняць напрамак палёту. У самцоў на горле мяшочкападобная скурная складка. Хвост тонкі і доўгі. Адкладваюць 2—6 яец у неглыбокую ямку. Кормяцца дробнымі насякомымі, пераважна мурашкамі.

ДРАКУНКУЛЁЗ, хвароба, гл. *Рышта*.

ДРА́МА (грэч. drama літар. дзеянне), 1) адзін з трох асноўных родаў літаратуры (побач з *эпасам* і *лірыкай*). Яна бліжэй да эпасу, хоць убірае ў сябе і асобныя элементы лірыкі. У параўнанні з інш. родамі л-ры Д. вызначаецца найбольшай аб'ектыўнасцю, дзеянне ў ёй разгортваецца сваімі сіламі, характары раскрываюцца ў непасрэдных сутыкненнях, без «удзелу» аўтара. Звычайна мае востры, напружаны сюжэт. Для Д. характэрны дынамізм, павышаная канцэнтрацыя дзеяння, якое ад завязкі і да кульмінацыі няўхільна нарастае і ўскладняецца, набывае большую змястоўнасць, захоплівае ў сваю арбіту ўсё больш персанажаў. Асабліва вял. роля належыць канфлікту — аснове, стрыжню Д., сутыкненням, непрымірымай барацьбе характараў. Адметнасць Д. ў тым, што ўсе падзеі ў ёй адбываюцца толькі ў цяперашнім часе, хоць твор можа быць прысвечаны і сучаснаму жыццю, і далёкаму мінуламу. Д. зарадзілася з нар. рытуалаў і фалькл. абрадаў, гульняў, карагодаў, калі разам з рухамі (пантамімай, танцамі) пачалі выкарыстоўваць і словы. Пабудаваная ў дыялагічнай форме і пазбаўленая апісальніцтва Д. разлічана на публічнае выкананне акцёрамі. Псіхал. моманты ўспрыняцця (неабходная займальнасць, цікавасць да твора і г.д.) абумоўліваюць эстэт. прынцыпы і законы Д. Яна абмежавана ў памерах, у колькасці сюжэтных ліній, персанажаў, у часе, месцы дзеяння. Належыць тэатру і л-ры, патрабуе высокіх літ.-маст. вартасцей і сцэнічнасці. Твор, напісаны ў дыялагічнай форме, але без уліку патрабаванняў тэатра, яго сцэнічнага выкарыстання, наз. «драмай для чытання» (нем. Lesendrama). Д. падзяляюцца на розныя жанры: *трагедыя, камедыя,* драма як жанр (гл. ніжэй), *меладрама, трагікамедыя, вадэвіль, фарс* і інш. На Беларусі Д. прайшла ўсе асн. этапы развіцця (гл. *Драматургія*), вядомы амаль кожны з яе жанраў.

2) Адзін з асн. і найб. пашыраных жанраў драм. твораў. Адлюстроўвае драм. калізіі, вострыя супярэчнасці, якія найчасцей у творы і вырашаюцца. Як і трагедыя, паказвае героя ў працэсе духоўнага росту ці дэградацыі, але без падкрэсленай яго велічнасці. Як і ў камедыі, у Д. больш паказваецца прыватнае жыццё персанажа, аднак асн. яе мэта — паказ героя ў драм. барацьбе. Д. як жанр у залежнасці ад агульнай накіраванасці, ахопу і адбору жыццёвых з'яў, выкарыстанню маст. сродкаў, паводле стылявых адзнак падзяляецца на сацыяльную, бытавую, гістарычную, дакументальную, псіхалагічную, гераічную, лірычную і інш. Элементы ўласна Д. ёсць у антычных драм. творах (напр., у Эўрыпіда) і асабліва рэнесансавай драматургіі. Як самаст. жанр склалася і атрымала тэарэт. абгрунтаванне толькі ў 2-й пал. 18 ст. ў асветнікаў (мяшчанская драма Д.Дзідро, Л.С.Мерсье ў Францыі, Г.Э.Лесінга ў Германіі). Для пачатковых этапаў развіцця Д. характэрна шчаслівае вырашэнне канфліктаў. У далейшым унутраны дынамізм узмацняецца, шчаслівая развязка сустракаецца ўсё радзей, а герой застаецца звычайна ў разладзе з грамадствам і самім сабой («Навальніца» і «Беспасажніца» А.М.Астроўскага, п'есы А.П.Чэхава, Б.Шоу, Б.Брэхта). На Беларусі Д. атрымала развіццё ў пач. 20 ст. ў творчасці К.Каганца («У іншым шчасці няшчасце схавана»), Я.Купалы («Раскіданае гняздо»), Я.Коласа («Антось Лата»), Л.Родзевіча («Пакрыўджаныя»), М.Гарэцкага («Атрута»). У большасці выпадкаў, дакладна ўзнаўляючы побыт, жыццёвыя рэаліі, гэтыя творы адлюстроўваюць сац. супярэчнасці і канфлікты, узнімаюць важныя праблемы, маюць высокае грамадзянскае гучанне. Набыла пашырэнне гіст. Д. («Кастусь Каліноўскі» Е.Міровіча, «Званы Віцебска» і «Кастусь Каліноўскі» У.Караткевіча, «Напісанае застаецца» А.Петрашкевіча, «Осцей — Альгердаў унук» І.Чыгрынава). Значнае месца занялі творы пра Вял. Айч. вайну («Проба агнём» і «Людзі і д'яблы» К.Крапівы, «Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона, «Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча, «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці» А.Махнача, «Апошні шанц» В.Быкава, «Радавыя» А.Дударава), а таксама пра сучаснае жыццё («Экзамен на восень» І.Шамякіна, «Трывога» і «Соль» Петрашкевіча, «Выклік багам» А.Дзялендзіка, «Парог» і «Вечар» Дударава, «Ку-ку» М.Арахоўскага, «Пеўчыя сорак першага года» Г.Марчука, «Пятля часу» Р.Баравіковай і інш.).

Літ.: гл. ў арт. *Драматургія*.

А.В.Сабалеўскі.

ДРАМАТУРГІ́Я (грэч. dramaturgia), сукупнасць драматычных твораў аднаго пісьменніка ці пэўнага народа, перыяду ці эпохі. Уключае прызначаныя для сцэн. ўвасаблення творы розных жанраў (*трагедыя, драма, меладрама, камедыя, вадэвіль, фарс*).

Вытокі бел. Д. — у фальклоры. Элементы драм. твораў былі ўжо ў нар. і культавых рытуалах, каляндарных і сямейна-бытавых абрадах, карагодах, тэатралізаваных гульнях (маналогі ці дыялогі). З фалькл. творчасці сфарміравалася ўласна нар. Д. *школьнага тэатра, батлейкі, народнай драмы.*

Новая бел. прафес. Д. ўзнікла ў пач. 1840-х г. Яе заснавальнікам стаў В.*Дунін-Марцінкевіч*. Важнае месца займаюць яго драм. творы «Сялянка», «Пінская шляхта» і «Залёты». У 19 ст. на бел. мове пісалі п'есы У.Сыракомля, П.Шпілеўскі, Ядвігін Ш., Г.Марцінкевіч, А.Вярыга-Дарэўскі; аднак большасць іх твораў была забаронена цэнзурай да друку і пастаноўкі. Адраджэнне бел. Д. адбылося ў пач. 20 ст. Пра тагачаснае жыццё і на гіст. тэмы пісалі п'есы К.Вясёлы («Не розумам сцяміў, а сэрцам»), К.Каганец («У іншым шчасці няшчасце схавана», «Двойчы прапілі», «Старажовы курган», «Сын Даніла», «Модны шляхцюк»). Пачынанні і набыткі К.Каганца прадоўжыў і ўзбагаціў Я.Купала. Яго Д. шматфарбная, разнастайная па жанрах: напачатку драм. паэмы (як подступ да ўласна драмы) «Адвечная песня», «Сон на кургане» і «На папасе», сцэн. жарт «Прымакі», камедыя «Паўлінка», рамант. драма «Раскіданае гняздо». Па яркасці, глыбіні раскрыцця характараў, жыццёвых праблем «Паўлінка» і «Раскіданае гняздо» — вяршыня ўсёй бел. Д.

У 1910-я г. дамінавала сац.-быт. драма з моцным грамадз. гучаннем, высокім драматызмам: «Блуднікі», «Пакрыўджаныя» Л.Родзевіча, «Атрута», «Антон» М.Гарэцкага, «Бутрым Няміра» Ф.Аляхновіча, «Антось Лата» Я.Коласа. Ствараліся п'есы рамант. кірунку («Кветка папараці», «Сягонняшнія і даўнейшыя» К.Буйло), дасціпныя камедыі («Пісаравы імяніны» У.Галубка). Інтэнсіўна развівалася Д. ў 1920-я г. Наследаваліся дэмакр., гуманіст. традыцыі, здабыткі папярэднікаў. Найб. дасягненне гэтага часу — «Няскончаная драма» і сакавітая камедыя «Пан міністр» Аляхновіча. Шмат і плённа пісаў Галубок: камедыі («Суд», «Ветрагоны», «Пінская мадонна») і меладрамы («Ганка», «Душагубы», «Плытагоны»). У Д. прыйшлі і новыя аўтары — Ц.Гартны, М.Грамыка, М.Чарот, В.Гарбацэвіч. У 1-й пал. 1920-х г. пашыраны фалькл. п'есы, у аснове якіх нар. легенды і паданні: «Машэка» і «Каваль-ваявода» Е.Міровіча, «На купалле» М.Чарота, «Вяселле» Гарбацэвіча і інш. З'явіліся п'есы пра падзеі Кастр. рэв. і грамадз. вайны на Беларусі («Чырвоныя кветкі Беларусі» Гарбацэвіча, «Каля тэрасы» Грамыкі) і гіст. мінулага («Пан Сурынта» Галубка, «Кастусь Каліноўскі» Міровіча). У 2-й пал. 1920-х г. у бел. Д. распрацоўвалася тагачасная тэматыка («Кар'ера таварыша Брызгаліна» Міровіча, «На прадвесні» М.Ільінскага), вядомасць атрымалі «Мост» Я.Рамановіча, «Гута» Р.Кобеца, «Міжбур'е» Дз.Курдзіна.

У 1930-я г. асабліва поўна раскрыўся талент Я.Коласа («Вайна вайне», «У пушчах Палесся») і К.Чорнага («Бацькаўшчына», «Ірынка»). З'явіліся п'есы К.Крапівы («Партызаны»), П.Глебкі («Над Бярозай-ракой»), В.Вольскага («Цудоўная дудка», «Несцерка»), М.Клімковіча («Кацярына Жарнасек») і інш. У Айч. вайну ў галіне Д. працавалі К.Крапіва, Рамановіч, А.Кучар. З найб. значных набыткаў часу — псіхал. драма «Проба агнём» К.Крапівы і асабліва яго сатыр. камедыя «Мілы чалавек». Падзеі вайны шырока адлюстроўваліся ў бел. Д. і ў наступныя дзесяцігоддзі: «Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона, «З народам», «Людзі і д'яблы» К.Крапівы, «Гэта было ў Мінску» Кучара, «Брэсцкая крэпасць», «Першы ўрок» К.Губарэвіча, «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці» А.Махната, «Марат Казей» В.Зуба і інш. П'есы першых пасляваен. гадоў пра тагачаснае жыццё напісаны ў рэчышчы «тэорыі бесканфліктнасці» («Алазанская даліна» Губарэвіча і І.Дорскага, «Песня нашых сэрцаў» В.Палескага, «Неспакойныя сэрцы» Кучара, «Зацікаўленая асоба», «Пяюць жаваранкі» К.Крапівы). Першым у бел. Д. выступіў супраць схематызму, бесканфліктнасці п'ес А.Макаёнак. У сатыр. камедыі «Выбачайце, калі ласка!» ён востра, з'едліва высмейваў паказуху і ашуканства. Значнае месца ў Д. 2-й пал. 1950-х г. займала тэма гіст. мінулага (п'есы П.Глебкі, Маўзона, П.Васілеўскага, І.Мележа). Лепшай з іх была п'еса Губарэвіча «Галоўная стаўка», карысталася поспехам драма І.Козела «Папараць-кветка».

1960-я г. — адзін з найменш плённых перыядаў у бел. Д. Слабы быў прыток маладых аўтараў. Звярнулі на сябе ўвагу п'есы «Лявоніха на арбіце» Макаёнка, «Над хвалямі Серабранкі» Козела, «Брэсцкі мір» Губарэвіча, «Пад адным небам» Маўзона, «Выгнанне блудніцы» І.Шамякіна, «Любоў, Надзея, Вера» Васілеўскага. У гэты час Макаёнак напісаў трагікамедыю «Пагарэльцы», але надрукавана яна толькі ў 1980, а пастаўлена ў 1981. У 1970-я г. адбыўся новы ўздым у бел. Д. П'есы гэтага часу вызначаліся больш глыбокай змястоўнасцю, яркімі вобразамі, арыгінальнасцю, багаццем жанраў: «Брама неўміручасці» К.Крапівы, «Трыбунал», «Зацюканы апостал», «Таблетку пад язык», «Святая прастата» Макаёнка, «Амністыя», «Апошняя інстанцыя» М.Матукоўскага, «Экзамен на восень», «І змоўклі птушкі» Шамякіна, «Апошні шанц» В.Быкава, «Злыдзень», «Укралі кодэкс», «Трывога» А.Петрашкевіча. Распрацоўвалася гіст. тэматыка: «Званы Віцебска», «Кастусь Каліноўскі», «Маці ўрагану» У.Караткевіча, «Напісанае застаецца» Петрашкевіча. У 1980-я г. па-ранейшаму ў Д. працавалі К.Крапіва («На вастрыі»), Макаёнак («Дыхайце эканомна»), Я.Шабан («Востраў Алены»), Караткевіч («Калыска чатырох чараўніц»), Петрашкевіч («Соль»), Матукоўскі («Мудрамер»). У Д. прыйшлі А.Дзялендзік, А.Асташонак, У.Бутрамееў, Г.Марчук, В.Ткачоў, А.Дудараў. П'есы апошняга «Вечар», «Парог» і асабліва «Радавыя» мелі значны поспех і пашырэнне на Беларусі і за яе межамі. У пач. 1990-х г. цікава заявіў пра сябе М.Арахоўскі. Яго п'есы «Машэка» і «Ку-ку» адметныя жыццёвым матэрыялам і маст. формай. У Д. дэбютавалі маладыя драматургі С.Кавалёў, З.Дудзюк, І.Сідарук, А.Дыбча, У.Сауліч, для іх творчасці характэрна разнастайнасць тэматыкі, розныя кірункі пошукаў.

З 1920-х г. праводзяцца конкурсы на лепшыя творы бел. Д. У 1981 у Мінску адкрыўся эксперыментальны т-р бел. Д. «Вольная сцэна», дзе ставяцца ў асн. п'есы маладых аўтараў.

Літ.: Семяновіч А.А. Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961; Яго ж. Гісторыя беларускай савецкай драматургіі, 1917—1955 гг. Мн., 1990; Сабалеўскі А. Беларуская савецкая драма. Кн. 1—2. Мн., 1969—72; Усікаў Я. Беларуская камедыя: (Ля вытокаў жанру). Мн., 1964; Яго ж. Беларуская камедыя. Мн., 1973; Лаўшук С.С. Сучасная беларуская драматургія. Мн., 1977; Яго ж. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пачатак 30-х гадоў). Мн., 1984; Шаўлоўская М.Ф. Беларуская драматургія. Мн., 1981; Пятрова Л.І. Рамантыкі пранікнёнае святло: Беларуская драматургія 20-х — 30-х гадоў. Мн., 1987; Васючэнка П.В. Драматургія і час. Мн., 1991; Ватацы Н.Б. Беларуская савецкая драматургія: Бібліягр. Мн., 1967.

А.В.Сабалеўскі.

ДРАМАТУРГІ́Я МУЗЫ́ЧНАЯ, сістэма выразных сродкаў і прыёмаў увасаблення ў музыцы драм. дзеяння на аснове агульных заканамернасцей *драмы*. У найб. дзейснай форме Д.м. выяўляецца ў муз.-сцэнічных жанрах (*опера, балет*), больш апасродкавана — у сферы інстр. музыкі. У жанрах муз. тэатра законы драмы набываюць своеасаблівую трактоўку ў сувязі з сінт. характарам гэтых жанраў і вызначальнай роляй музыкі. Гістарычна склаліся 2 асн. тыпы Д.м — нумарны і скразны. У нумарным тыпе драматург. функцыі завершаных нумароў звязаны з пэўным прыпыненнем дзеяння (у оперы — перш-наперш арыя, у балеце — адажыо, варыяцыі), або непасрэдным яго развіццём (у оперы — рэчытатыў, у балеце — па д'аксён). Аднак і ў межах гэтага тыпу ўсё большае значэнне набывалі нумары, якія маглі выконваць абедзве драматург. функцыі (у оперы — ансамблі і хары, у балеце — па-дэ-дэ, па-дэ-труа). У выніку збліжэння завершаных і свабодных эпізодаў сфарміраваўся скразны тып драматургіі, калі дзеянне ахоплена безупыннym муз. развіццём. Скразны тып драматургіі складваўся пад уплывам сімф. музыкі (адзін з асн. сродкаў сімфанізацыі муз.-драм. жанраў — *лейтматыў*). Найб. пашырана Д.м., дзе спалучана скразное муз. развіццё з часовымі прыпынкамі дзеяння. У оперным мастацтве 20 ст. вылучаюць і мантажны тып Д.м. (структурная адзінка — эпізод), якому ўласцівы расчлянёнасць, хуткая змена сцэн, раптоўныя павароты сцэн. дзеяння, налажэнні кантрастных планаў. Першыя бел. оперы «Тарас на Парнасе» М.Аладава і «Кветка шчасця» А.Туранкова заснаваны на прынцыпах нумарной драматургіі. У операх «Міхась Падгорны» Я.Цікоцкага і «У пушчах Палесся» А.Багатырова спалучаюцца прынцыпы нумарной і скразной драматургіі, якая пазней стала асновай развіцця нац. оперы і балета. Рысы мантажнага тыпу драматургіі ўласцівы муз.-сцэн. творам сярэдзіны 1960-х г. (тэлеопера «Ранак» Г.Вагнера, «Джардана Бруна» С.Картэса). Існуюць мяшаныя формы Д.м., якія аб'ядноўваюць элементы оперы і ўласна драмы (*аперэта*, муз. камедыя, *мюзікл*); да сферы Д.м. іх адносяць, калі ў музыцы вырашаны найважн. вузлавыя моманты драм. дзеяння (аперэты «Несцерка» Р.Суруса, «Мільянерка» Я.Глебава, мюзіклы «Джулія» і «Залёты» У.Кандрусевіча і інш.).

Паняцце Д.м. выкарыстоўваюць і ў дачыненні да твораў інстр. музыкі, не звязаных са сцэн. дзеяннем або пэўнай літ. праграмай. У інстр. музыцы паводле якасных адзнак вылучаюць Д.м. бескантрастную, кантрастную і канфліктную, паводле колькасных — 1-, 2-, 3- і шматэлементную. У працэсе гіст. развіцця муз. мастацтва ў некат. тыпавых формах склаліся пэўныя драматург. стэрэатыпы (прынцыпы санатнасці, цыклічнасці і інш.). Спецыфічныя заканамернасці, якім падпарадкоўваецца развіццё муз. вобразаў у інстр. музыцы, толькі часткова супадаюць з законамі сцэн. драмы.

Літ.: Друскин М.С. Вопросы музыкальной драматургии оперы. Л., 1952; Ярустовский Б. Драматургия русской оперной классики. М., 1953; Яго ж. Очерки по драматургии оперы XX в. Кн. 1—2. М., 1971—78; Конен В.Д. Театр и симфония. 2 изд. М., 1975; Кулешова Г.Г. Вопросы драматургии оперы. Мн., 1979; Чернова Т.Ю. Драматургия в инструментальной музыке. М., 1984.

А.А.Друкт.

ДРАМАТЫ́ЗМ, эстэтычная катэгорыя, што адлюстроўвае і абагульняе супярэчнасці і канфлікты чалавечага жыцця, узаемадзеянне чалавека з навакольным грамадскім і прыродным асяроддзем. Найб. поўным і канцэнтраваным праяўленнем Д. з'яўляецца драм. канфлікт як спецыфічна эстэт. форма выяўлення жыццёвых супярэчнасцей, форма адлюстравання ў мастацтве востраго сутыкнення процілеглых чалавечых учынкаў, ідэй, імкненняў, страсцей. У мастацтве драм. канфлікт вылучаецца глыбінёй і значнасцю ідэйнага і сац. зместу, вастрынёй і напружанасцю і выражаецца ў дасканаламаст. форме.

ДРАМАТЫ́ЧНАЯ ПАЭ́МА, жанравы тып *паэмы*, які ўзнік на мяжы паэзіі і драматургіі. Развіваецца на аснове арган. зліцця эпічнага і драм. пачаткаў. Выпрацавала і замацавала ўстойлівыя жанравыя прыкметы: канфліктна-напружанае сутыкненне характараў, маральна-этычных пазіцый, ідэалаў, страсцей, што складае асн. драм. «спружыну» твора, якому ўласціва маналагічна-дыялогавая форма, разгортванне дзеі, набліжанай да сцэнічнай падачы.

Аднак гэта найперш паэма, жанравую сутнасць якой вызначае сіла эпічнай паэтызацыі падзей і герояў, паэт. падыход ад іх увасаблення. Д.п. адметная схільнасцю да асэнсавання вузлавых перыядаў нац. гісторыі, буйных грамадскіх асоб, значных падзей. Яе зместам становіцца барацьба народа ў напружаныя моманты яго сац. і нац. самасцвярджэння. Дасягнула класічных узораў у творчасці Дж.Мільтана («Страчаны рай»), Дж.Байрана («Каін»), Ф.Шылера («Валенштэйн»), П.Б.Шэлі («Раскаваны Праметэй»), А.Міцкевіча («Дзяды»), А.Пушкіна («Барыс Гадуноў»), Л.Украінкі («Лясная песня») і інш. У бел. л-ры пачынальнік яе — Я.Купала, які даў узоры высокіх формаў драматычна-паэмнага мастацтва («Адвечная песня», «Сон на кургане»). Д.п. стварылі П.Глебка («Над Бярозай-ракой»), А.Куляшоў («Хамуціус»). Нац. традыцыя драматычна-паэмнага асэнсавання жыцця ў апошні час атрымала працяг у паэмах М.Арочкі («Курганне», «Крэва»). *М.М.Арочка, А.С.Гурская.*

ДРАМАТЫ́ЧНАЯ СЕ́КЦЫЯ БЕЛАРУ́СКАЙ ВУЧНЁЎСКАЙ ГРАМАДЫ́. Існавала ў кастр. 1919 — ліп. 1920 у Мінску. Аб'ядноўвала маладых аматараў тэатр. мастацтва. Працавала ў «*Беларускай хатцы*». Кіраўнік С.Іваноў (Сымон-Музыка). Ставіліся пераважна бел. аднаактовыя п'есы: «Пашыліся ў дурні» М.Крапіўніцкага, «Пасля смерці» і «На маскарад» Іванова, «Слуцкая варона» і «Мікітаў лапаць» М.Чарота, «На дарозе жыцця» Я.Коласа і інш. Сярод удзельнікаў былі акцёр А.*Ільінскі* (Лапаць малодшы), паэт А.*Дудар*.

«ДРАНГ НАХ О́СТЭН» (ням. Drang nach Osten — націск на Усход), экспансіянісцкая палітыка Германіі ў дачыненні да краін Цэнтр., Усх. і Паўд.-Усх. Еўропы ў 9—20 ст., а таксама лозунг і гіст.-паліт. канцэпцыя, накіраваная на ідэалаг. абгрунтаванне і апраўданне гэтай палітыкі. Першапачаткова (9 ст.) Усх.-Франкскае (Герм.) каралеўства вяло наступ на тэр. Вялікаморавскай дзяржавы, Пасаўскай і Далмацінскай Харватыі. У 10—11 ст. «Свяшчэнная Рым. імперыя» прэтэндавала на землі палаба-прыбалт. славян, Чэхіі і Польшчы. У 2-й пал. 12 ст. — пач. 15 ст. брандэнбургскія і саксонскія князі пакарылі палаба-прыбалт. славян, *Тэўтонскі ордэн — прусаў*, ням. купцы, каталіцкая царква, Ордэн *мечаносцаў* і *Лівонскі ордэн* прасачыліся ва Усх. Прыбалтыку (далейшы рух на У спынены ў выніку *Лядовага пабоішча 1242* і *Грунвальдскай бітвы 1410*), а Габсбургі захапілі славенскія землі. У 16—18 ст. утварылася шматнац. манархія Габсбургаў, якія падпарадкавалі Чэхію, Славакію, Венгрыю і Харватыю, у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795) значна павялічылася тэр. Прусіі. У 1850-я г. пачалася распрацоўка канцэпцыі «Д.н.О.» (гл. *Пангерманізм, Пангерманскі саюз*). Герм. імперыя (1871—1918) выкарыстоўвала пераважна эканам. пранікненне. Спробы рэалізацыі «Д.н.О.» мелі месца ў 1-ю і асабліва 2-ю сусв. войны (гл. план «*Ост*»).

Літ.: Германская восточная политика в новое и новейшее время: Проблемы истории и историографии. М., 1974; «Дранг нах Остен» и народы Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы, 1871—1918 гг. М., 1977.

ДРАНЕ́НКА Мікалай Аляксеевіч (н. 3.8.1946, в. Маргойцы Сенненскага р-на Віцебскай вобл.), бел. мастак. Прадстаўнік *Віцебскай школы акварэлі*. Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1969). У 1979—82 гал. мастак

М.Драненка. Камянецкі пейзаж. 1990.

А.Дранец. Памятная дошка Ф.Скарыне ў Празе на будынку Нацыянальнай бібліятэкі. 1996.

Віцебскіх маст.-вытв. майстэрняў. Працуе пераважна ў тэхніцы акварэлі, алейнага жывапісу. Пранікнёна перадае прыгажосць роднага краю ў карцінах «Над Дзвіной» (1980), «Касцёл у Камаях» (1981), «Адвечнае» (1986), «Камянецкі пейзаж» (1990), «Назіральная вежа» (1991), «Буслы» (1996). Сярод твораў: нацюрморты «Бярозавы сок» (1979), «Жоўтыя кветкі» (1984), «Вяргіні» (1986), тэматычная кампазіцыя «Брат вярнуўся» (1984), партрэты хірурга-траўматолага Ліцкалава (1978), Ф.Малахава (1981), механізатара М.Парэпкі (1981) і інш. Аўтар маст. вырашэння больш як 30 каталогаў, буклетаў пра віцебскіх мастакоў, серыі экслібрысаў. Маст. мова адметная лёгкімі лінейнымі рытмамі, дынамічнай пластыкай і экспрэсіяй колеру.

Літ.: Цыбульскі М. Свавольны дух акварэлі // Беларусь. 1996. № 9; Мікалай Драненка: Кат. / Скл. М.Цыбульскі. Віцебск, 1996. *М.Л.Цыбульскі.*

ДРА́НЕЦ Аляксандр Валянцінавіч (н. 31.1.1962, в. Харомск Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. скульптар. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1987). Працаваў у творчай майстэрні скульптуры пры АМ СССР (1989—93), з 1996 выкладчык Бел. АМ. Творчасці ўласцівы багацце пластычнай мовы, цікавасць да славутых дзеячаў бел. гісторыі: «Кастусь Каліноўскі» і «Дунін-Марцінкевіч» (абодва 1985), праект помніка Цётцы (1987), памятныя дошкі Ф.Скарыне на будынках Нац. АН Беларусі (1990) і чэш. Нац. бібліятэкі (Прага, 1996) і інш. Пераможца Рэсп. конкурсу праектаў помніка Ф.Скарыне для Мінска (1990).

ДРА́НЕЎКА, рака, гл. *Абедаўка*.

ДРА́НІКІ, драчонікі, бульбянікі, бліны з бульбы, традыцыйная бел. страва. Гатуюць з дранай (таркаванай) на тарцы бульбы, у якую часам дадаюць муку. Пякуць вялікімі (на ўсю патэльню) або невялікімі накшталт аладак. Да Д. смажаць сала, робяць мачанне з тварагу і смятаны. На Беларусі пашыраны ўсюды. На Віцебшчыне пад назвай драчоны вядомы бліны з пшанічнай, змешанай з жытняй, мукі.

ДРАНЬКО́-МАЙСЮ́К Леанід Васілевіч (н. 10.10.1957, г. Давыд-Гарадок Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. паэт. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага (1982). З 1982 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Друкуецца з 1972. Першы зб. паэзіі «Вандроўнік» (1983). Аўтар зб. вершаў «Над пляцам» (1986), вершаў, паэм, эсэ «Тут» (1990), «Акропаль» (1994), прозы «Пра тое, як я...» (1992). Распрацоўвае тэмы творчасці, працы, кахання. Асобныя вершы пакладзены на музыку.

Тв.: Стомленасць Парыжам: Вершы і эсэ. Мн., 1995.

ДРАП (ад франц. drap сукно), тоўстая тканіна з шэрсці. Звычайна мае 2 слоі, добра захоўвае цяпло. Бывае варсаваны і неварсаваны, адна- і шматкаляровы. З Д. шыюць верхняе адзенне.

ДРАПЕ́ЖНІКІ, прадстаўнікі жывёльнага або расліннага свету, якія ловяць, забіваюць і паядаюць жывыя арганізмы. Трапляюцца сярод жывёл, грыбоў і раслін (гл. *Драпежныя грыбы, Драпежныя звяры*). Д. — важны фактар натуральнага адбору: пастаянна паляпшаюць склад папуляцый ахвяр, што ў пэўнай ступені абумоўлівае іх прагрэс. развіццё. Садзейнічаюць захаванню вял. відавой разнастайнасці і зніжаюць інтэнсіўнасць канкурэнцыі сярод розных відаў ахвяр. У Д. звычайна добра развіты сродкі авалодання, забівання, паядання і пераварвання здабычы (зубы і кіпцюры ў млекакормячых, ядавітыя залозы ў павукоў, жыгучыя клеткі ў кішачнаполасцевых, ферменты, якія расшчапляюць бялкі, у жывёл, грыбоў, раслін), а таксама нерв. сістэма, органы пачуццяў.

1

2

3

4

5

6

Выкарыстоўваюцца ў біял. барацьбе з непажаданымі для чалавека відамі.

С.У.Кучмель.

ДРАПЕ́ЖНЫЯ ГРЫБЫ́, мікраскапічныя сапратрофныя грыбы, здольныя ўтвараць на грыбніцы лоўчыя прыстасаванні, каб захопліваць здабычу — нематод, інфузорый, амёб і інш. Пашыраны па ўсім зямным шары. Трапляюцца пераважна ў глебе, на раслінных рэштках, экскрэментах жывёл, каранях раслін і г.д. Большасць Д.г. адносіцца да *гіфаміцэтальных*, некат. да перанаспаральных, хітрыдыяміцэтаў. Выкарыстоўваюцца для біял. барацьбы з нематодамі.

Міцэлій галінасты, на ім развіваюцца пасткі 3 тыпаў: клейкія (бакавыя выросты гіфаў, шарападобныя галоўкі, сеткі), кольцы без клейкага рэчыва (дзейнічаюць механічна, ахвяра захрасае ў іх), кольцы з унутранай адчувальнай да дотыку паверхняй (сціскаюць ахвяру). У пастцы з дапамогай ферментаў растварэцца абалонка здабычы, грыбы прапускаюць у яе цела свае парасткі, якія паступова ператвараюцца ў развіты міцэлій.

ДРАПЕ́ЖНЫЯ ЗВЯРЫ́ (Carnivora), млекакормячыя атр. драпежных. 7 сям., 90 родаў, 232 віды. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды. У шэрагу месцаў акліматызаваны. Жывуць на адкрытых прасторах, у гарах, лясах і інш. Большасць аселыя, інш. мігруюць. Трымаюцца па адным або парамі, зрэдку аб'ядноўваюцца ў статкі. Большасць *драпежнікі*, радзей усёедныя. Актыўныя пераважна ў прыцемках і ноччу. У Чырв. кнізе МСАП 36 відаў і 20 падвідаў. На Беларусі жыве 15 відаў з 6 сямействаў. З віды занесены ў Чырв. кнігу: *барсук, буры мядзведзь, рысь*.

Даўж. цела ад 11 см (ласка) да больш як 300 см (тыгры), маса ад 100 г да 1000 кг (белы мядзведзь). Цела ўкрыта валасамі, сярод якіх вылучаюць накіравальныя, восцевыя і пуховыя. Лінькі 2 або 1, у зімовы час валасяное покрыва больш густое. Зубы падзяляюцца на разцы, вял. конусападобныя востраканцовыя вынутыя іклы і карэнныя (сярод іх — драпежныя зубы). Характэрны развітыя грабяні на чэрапе для мацавання моцнай сківічнай мускулатуры. Пераважна манагамы. Дзіцянят 1—8, зрэдку 20—22, нараджаюцца слепыя і бездапаможныя. Многія Д.з. — аб'екты промыслу і зверагадоўлі, некат. шкоднікі.

С.У.Кучмель.

ДРАПІРО́ЎКА (франц. draperie), размяшчэнне і агульны характар складак

7

Драпежныя звяры: 1 — леапард амурскі; 2 — генета плямістая; 3 — гарнастай; 4 — панда малая; 5 — пясец меднаўскі; 6 — мядзведзь камчацкі; 7 — гіена плямістая.

адзення або тканіны; адзін са сродкаў стварэння маст. вобраза. Выкарыстоўваецца ў афармленні інтэр'ераў грамадскіх і жылых будынкаў, тэатр.-дэкар. і выяўл. мастацтве.

У мастацтве сярэдневякоўя Д. вызначалася кампазіцыйнай умоўнасцю, хавала чалавечую фігуру, не выяўляла яе пластыкі, руху, характарнасці. Для жывапісных твораў характэрна Д. ў выглядзе вял. колеравых плям, падзеленых каліграфічнымі лініямі. У мастацтве Адраджэння падкрэслівала жыццёвасць, адчувальнасць фігуры. Напружаны дынамізм барока выявіўся ў паказе імклівага, стыхійнага руху складак. У мастацтве класіцызму ўраўнаважанасць Д. садзейнічала стварэнню абстрактна ідэалізаванага вобраза. Для рамантызму характэрна неспакойная, рухомая Д., што падкрэслівала ўсхваляванасць агульнага вобразнага ладу. У рэаліст. мастацтве 19 ст. Д. мела натуральны характар, набліжаны да матэрыяльнай адчувальнасці.

Разнастайнасцю вызначаецца Д. ў творах бел. мастакоў. Насычаны каларыт, пастознасць пісьма надаюць ёй дэкар. характар у творах М.Станюты і М.Філіповіча. Рысы экспрэсіўнасці мае яна ў творах А.Анікейчыка, М.Данцыга, А.Кашкурэвіча, М.Савіцкага і інш. Імкненнем да макс. выразнасці Д. вызначаюцца творы А.Марачкіна, М.Селешчука, У.Тоўсціка. *В.Я.Буйвал.*

ДРАСЕЛЯВА́ННЕ (ад ням. drosseln душыць; скарачаць), працяканне вадкасці, пары або газу праз мясц. гідрадынамічнае супраціўленне патоку (звужэнне трубаправода, вентыль, кран і інш.). Суправаджаецца змяншэннем ціску, калі паток не выконвае знешняй работы і адсутнічае цеплаабмен з навакольным асяроддзем. Пры Д. рэальных газаў адначасова змяняецца т-ра (гл. *Джоўля—Томсана эфект*). Выкарыстоўваецца для ахалоджвання і звадкавання газаў, вымярэння і рэгулявання расходу вадкасці і газаў.

ДРАСЁН (Persicaria), род кветкавых раслін сям. драсёнавых. Каля 150 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмерана цёплых і трапічных абласцях Паўн. паўшар'я, таксама ў Паўд. Амерыцы. На Беларусі 8 дзікарослых відаў: Д. земнаводны, або вадзяная грэчка (P. amphibia), перцавы, або вадзяны перац (P. hydropiper), раскідзісты (P. lapathifolia), ільняны (P. linicola), плямісты (P. maculata), малы (P. minor), мяккі (P. mitis), шурпаты (P. scabra). Растуць у вадзе, па берагах рэк і вадаёмаў, у сырых лясах як пустазелле. Як дэкар. расліну вырошчваюць Д. усходні (P. orientalis).

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны з прамастойным або ўзыходным, іншы раз апушчаным у ваду раўнамерна аблісцелым сцяблом. Лісце звычайна ланцэтнае, на кароткіх чаранках, з раструбам, у водных формаў — эліптычнае ці ланцэтна-яйцападобнае, голае і гладкае, на доўгіх чаранках. Кветкі ружовыя, ружова-белыя, белаватыя ці зеленаватыя, двухполыя, сабраныя ў верхавінкавыя гронкападобныя суквецці, размешчаны пучкамі ў похвах прыкветнікаў-раструбаў на кароткіх кветаножках. Плод — арэшак. Лек., кармавыя і дэкар. расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДРАСЁНАКВЕ́ТНЫЯ (Polygonales), парадак двухдольных кветкавых раслін. Уключае 1 сям. — драсёнавыя, больш за 30 родаў, каля 800 відаў. Пашыраны амаль па ўсім зямным шары, асабліва ў паўн. умераных паясах. На Беларусі больш за 30 дзікарослых і каля 10 інтрадукаваных відаў з 9 родаў. Найб. вядомыя роды: *грэчка, драсён, рэвень, шчаўе*. Сярод Д. лек., кармавыя, каштоўныя харч., дубільныя, фарбавальныя і меданосныя расліны, ёсць ядавітыя.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны, паўкусты, кусты, ліяны, рэдка дрэвы (у тропіках). Сцябло галінастае, вузлаватае, каленчатае. Лісце звычайна чаргаванае, рэдка супраціўнае або кальчаковае, простае, суцэльнае ці лопасцевае, з прылісткамі, якія зрастаюцца каля асновы чаранка ў раструб. Кветкі дробныя, звычайна двухполыя, правільныя, трохчленныя, беспялёсткавыя, сабраныя ў складаныя суквецці. Плод — трохгранны арэшак. Насенне з мучністым эндаспермам.

ДРАЎЛЯ́НАЕ ДО́ЙЛІДСТВА, від архітэктуры, якому ўласцівы адзінства буд. матэрыялу (дрэва) і спецыфічных канструкцый; мастацтва ствараць будынкі з дрэва, арганічна спалучаючы вырашэнне функцыянальных, канструкцыйных і маст. задач.

Дрэва — канструкцыйны і аддзелачны матэрыял. Шырока ўжываецца ў буд-ве з-за лёгкасці апрацоўкі, дастатковай мех. трываласці, малой аб'ёмнай вагі, магчымасці ства-

Да арт. **Драўлянае дойлідства.** Царква Святога Варфаламея. Сяло Кочы каля г. Хрудзім. Чэхія. 1307.

Да арт. **Драўлянае дойлідства.** Дамы ў вёсцы Рашкопаў. Паўночна-Заходняя Чэхія. Сярэдзіна 19 ст.

Да арт. **Драўлянае дойлідства.** Ільінская царква ў г. Белазерск Валагодскай вобл. (Расія). 1690.

Да арт. **Драўлянае дойлідства.** Кіжы. 18 ст.

Да арт. **Драўлянае дойлідства.** Касцёл у вёсцы Дуды Іўеўскага раёна Гродзенскай вобл.

Да арт. **Драўлянае дойлідства.** Троіцкая царква ў г. Ельск Гомельскай вобл.

Да арт. **Драўлянае дойлідства**. Касцёл у вёсцы Мяжаны Браслаўскага раёна Віцебскай вобл.

Драўлянае дойлідства рускай Поўначы.

Да арт. **Драўлянае дойлідства**. Дом-музей П.Бажова ў г. Сысерць (Расія).

Драўлянае дойлідства рускай Поўначы.

Да арт. **Драўлянае дойлідства**. Міхайлаўская царква. Закарпацкая Украіна. 2-я пал. 18 ст.

Да арт. **Драўлянае дойлідства**. Вятрак з вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобл.

раць эстэт. выразнасць яго структурнасці, фактуры, колеру. Выкарыстоўваюць розныя драўляныя элементы: бярвенне, брусы, дыелі, гонту і інш. Маст. выразнасць у Д.д. дасягаецца спалучэннем і адначасова супрацьпастаўленнем простых геам. форм (у аснове якіх адзіны модуль, роўны даўжыні бервяна ці адзінцы вымярэння), а таксама разьбой. Д.д. — адметная з'ява ў матэр. і маст. культуры многіх народаў. Адзіныя буд. прыёмы вызначаюць архітэктуру практычна ўсіх тыпаў будынкаў (жылых, гаспадарчых, абарончых, грамадскіх, прамысловых і інш.) пры багацці і разнастайнасці агульных вырашэнняў, якія ўлічваюць сан.-эканам., прыродна-кліматычныя ўмовы. З-за параўнальнай недаўтавечнасці драўніны і пажараў не захавалася драўляных збудаванняў стараж. часоў, хоць археал. даследаванні даюць звесткі аб па́леавых пабудовах эпохі палеаліту, неаліту, бронзавага веку. Найбольш стараж. помнікі Д.д., якія захаваліся, — каркасныя канструкцыі, што складаюцца са стоек, бэлек, раскосаў і агараджальных элементаў: храмы ў Кітаі і Японіі (9 ст.), Нарвегіі (12 ст.). Каркасныя канструкцыі, у параўнанні са зрубнымі (гл. *Вянковая канструкцыя*), даюць магчымасць ствараць больш вольныя кампазіцыі, што фарміруюцца рытмічнымі радамі калон, бэлек, рыгеляў. Каркасная сістэма шырока выкарыстоўваецца ў Акіяніі, Паўд. Амерыцы, Афрыцы, Паўд.-Усх. Азіі. Зрубныя канструкцыі атрымалі пашырэнне ў Еўропе і Канадзе.

На Беларусі драўляныя пабудовы вядомы з эпохі палеаліту. Укапаныя ў зямлю слупы і сохі стваралі аснову сцен і падтрымлівалі дах. З часам з гэтых канструкцый развіліся каркасныя. Як іх варыянт у 16—18 ст. выкарыстоўвалі фахверк («прускі мур»). Прыкладна з 3 ст. атрымліваюць развіццё зрубныя канструкцыі з бярвён (звычайна ў сялянскім буд-ве) ці брусоў (у гар. і манум.). Больш дасканалыя і зручныя, яны сталі найб. пашыранымі. Змены ў сял. буд-ве ішлі павольна, а на манум. Д.д. (пачынаючы з 17 ст.) значна ўплывалі маст. стылі мураванай архітэктуры. Вызначыліся 2 асн. тэндэнцыі развіцця: кансерватыўная, звязаная з мясц. традыцыямі (гл. *Народнае дойлідства*) і наватарская, арыентаваная на ўкараненне эстэт. канцэпцый стыляў *барока, класіцызму* з выкарыстаннем форм і прыёмаў, уласцівых мураванай архітэктуры (аркі, склянені, карнізы, пілястры, руст, шалёўка і інш.). Асн. тыпы жылых дамоў — 1-, 2-, 3-камерныя і больш складанай планіроўкі, якія будавалі асобна ці разам з інш. пабудовамі ў складзе сядзіб-комплексаў (Паазер'е), сядзіб вянковага (Падняпроўе, Паазер'е, Усх. Палессе) ці пагоннага (Зах. Палессе, Панямонне, цэнтр. Беларусь) тыпаў. У гарадах і мястэчках будавалі дамы з галерэямі на гал. фасадзе (падчэнню) і 2-павярховыя жылыя дамы. Асаблівасці гасп. пабудоў (свіран, лямус, адрына, гумно, хлеў, склеп і інш.) залежалі ад іх прызначэння і заможнасці гаспадаркі. Вытворчыя збудаванні (вятрак, вадзяны млын) характарызуюцца аб'яднаннем у адно цэлае механізма з драўлянымі канструкцыямі будынка. У сярэдневякоўі былі пашыраны драўляныя абарончыя збудаванні гарадоў (Віцебск, Полацк і інш.) і феад. замкаў (Радашковічы, Кобрын, Нясвіж і інш.). З дрэва будавалі ўсе тыпы грамадскіх будынкаў: ратушы (Шарашова, Віцебск, Драгічын), манежы (Клецк), свірны-«магазыны» (Тураў, Любча), тэатры (Слуцк, Нясвіж), гандлёвыя рады (Давыд-Гарадок, Карэлічы), крамы, корчмы, шпіталі, школы і інш. Драўлянымі былі будынкі першых мануфактур (Налібакі, Урэчча, Слуцк).

Драўляныя цэрквы 17—19 ст. падзяляліся на храмы восевай кампазіцыі, у якіх 1, 2, 3 ці больш зрубаў размешчаны па адной падоўжнай восі (Здзітаўская Мікітаўская царква ў Жабінкаўскім р-не, Слуцкая Міхайлаўская царква, Давыд-Гарадоцкая Георгіеўская царква ў Столінскім р-не), і крыжовай, у якіх 4 або 5 зрубаў пастаўлены па 2 узаемна перпендыкулярных восях (Ельская Троіцкая царква, Кажан-Гарадоцкая Мікалаеўская царква ў Лунінецкім р-не, Порплішчанская Спаса-Праабражэнская царква ў Докшыцкім р-не). Зрубы завяршаліся вальмавымі ці 2-схільнымі дахамі, шатрамі, шмат'ярусныя вярхамі, купаламі. Сярод касцёлаў 17—19 ст. вылучаюцца 1- і 3-нефавыя (Дудаўскі касцёл Марыі ў Іўеўскім р-не, Гудагайскі касцёл Маці Божай у Астравецкім р-не, Адэльскі касцёл Ушэсця ў Гродзенскім р-не), з якіх найб. пашыраны былі 3-нефавыя базілікі з 2-вежавым гал. фасадам. Такая аб'ёмна-планіровачная структура ў розных варыянтах спалучалася з традыц. вырашэннямі ў архітэктуры драўляных уніяцкіх цэркваў (Сяпанкаўская Міхайлаўская царква ў Жабінкаўскім р-не). Вядомы храмы цэнтрычнай кампазіцыі з 4-, 6- або 8-гранным планам, завершаныя шатром ці купалам. Званіцы ў выглядзе шмат'ярусных вежаў звычайна ставілі ў куце храмавага пляца або над галоўнай брамай у агароджы (г.п. Шарашова Пружанскага р-на, в. Чэрск Брэсцкага р-на, в. Лявонпаль Міёрскага р-на). Сінагогі 17—18 ст. рабілі цэнтрычнай кампазіцыі з квадратнай малітоўнай залай, завершанай складаным, часам шмат'ярусным скляпеннем (Гродна, Нароўля, в. Воўпа Ваўкавыскага р-на). У архітэктуры сінагог, як і ў драўляных мячэцях (в. Даўбучкі Смаргонскага р-на, г.п. Іўе), выкарыстоўваліся элементы мясц. грамадскай і жылой архітэктуры: алькежы, галерэі, маст. разьба.

Паляпшэнне якасці драўніны (прасаванне, антысептіраванне, выкарыстанне клею) дазваляе ствараць канструкцыйныя элементы практычна любых памераў і форм. Таму для грамадскіх і прамысл. будынкаў, асабліва з вял. (да 90 м і болей) пралётамі, з дрэва робяць аркі, рамы, абалонкі: крытыя стадыён у Фларыдзе (ЗША), каток у Грэноблі (Францыя), палац спорту ў Архангельску (Расія). На Беларусі клееныя рамы ствараюць аснову канструкцыі склада ў Салігорску, спарт. залаў у Мінску, Гомелі і інш. Дэкаратыўныя якасці драўляных элементаў істотна ўплываюць на стварэнне эфектнага вонкавага выгляду будынкаў і іх інтэр'ераў.

Помнікі бел. Д.д. прадстаўлены ў *Археалагічным музеі Бярэсце* і *Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту*.

С.А.Сергачоў.

Да арт. **Драўлянае дойлідства**. Сінагога. Горад Заблудаў. Польшча. Пач. 17 ст.

Да арт. **Драўлянае дойлідства**. Жылы дом у г. Клімавічы Магілёўскай вобл.

ДРАЎЛЯ́НЕ, племянное аб'яднанне ўсх. славян у 8—10 ст., якое жыло на правабярэжжы Прыпяці ў міжрэччах Гарыні, Ужа, Цецерава, Дняпра. Назва паходзіць ад лясной мясцовасці. На У межавалі з *палянамі*, на З — *валынянамі* (па Случы) і *бужанамі*, на Пн з *дрыгавічамі*. Самыя стараж. помнікі Д. — курганныя могільнікі з трупаспаленнем, у канцы 10 ст. з'яўляюцца курганы з тру-

папалажэннем на гарызонце, у насыпе або ў яме галавой на З. Пахавальны інвентар: пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы, шкляныя і сердалікавыя пацеркі, жалезныя нажы і інш. Займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, ганчарствам, ткацтвам, апрацоўкай жалеза. Жылі ў паўзямлянках. Гал. гарады: Уручый (Оўруч), Горадск; у Іскарасцені (Корасцень) жыў князь і старэйшыны з мясц. знаці. У 9—10 ст. мелі сваё паліт. аб'яднанне — «княжанне». Пры князі *Вользе* (сярэдзіна 10 ст.) землі Д. далучаны да Кіева і ператвораны ва ўдзельнае княства з цэнтрам у г. Уручый. Апошні раз упамінаюцца пад 1136.



Драўляная канструкцыя: *а* — фермы, бэлькі і панэлі (1 — трохвугольная брусчатая, 2 — трапецаідальная металадраўляная, 3 — дашчана-цвіковая трохшарнірная арачная ферма, 4 — клееная трохшарнірная рама, 5 — клееная двухшарнірная арка, 6 — клееная бэлька двухтаўровага або прамавугольнага сячэння, 7 — клееная трохслойная панэль перакрыцця); *б* — каркасная (фахверкавая) канструкцыя (1 — гарызантальныя прагоны, 2 — вертыкальныя стойкі для мацавання абшыўкі).

Літ.: Седов В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982. *Г.В.Штыхаў.*

ДРАЎЛЯ́НЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ, будаўнічыя канструкцыі (фермы, аркі, рамы, скляпенні, бэлькі і інш.), зробленыя поўнасцю ці пераважна з *драўніны*. Д.к. — адны з найб. старажытных (гл. *Драўлянае дойлідства*). Выкарыстоўваюць у жыллёвых і грамадскіх будынках, мастах, эстакадах, с.-г. збудаваннях і інш.

Адрозніваюць Д.к. з бярвён, брусоў і дошак, якія злучаюцца ўрубкамі, шпонкамі, нагелямі, балтамі, цвікамі, метал. мацаваннямі, а таксама склейваннем (гл. *Клееныя канструкцыі*). Яны лёгкія і дастаткова трывалыя. Іх устойлівасць супраць загнівання, вільгаці і агню павышаюць *антысептычныя сродкі, антыпірэны*, спец. вогнеахоўнымі пакрыццямі, *гідраізаляцыяй*. У Д.к. выкарыстоўваюць таксама *драўнянастружжавыя пліты, драўнянавалакністыя пліты*, іншыя *драўняныя матэрыялы*.

ДРАЎНІ́НА, ксілема, тканка раслін, складзеная з клетак з адраўнелымі абалонкамі. Надае расліне трываласць, праводзіць ваду з растворанымі ў ёй рэчывамі, з'яўляецца месцам назапашвання пажыўных рэчываў. Складае асн. масу ствала, каранёў і галін дрэвавых раслін, размешчана паміж стрыжнем і *камбіем*.

Гал. анат. элементы Д. — сасуды (трахеі), трахеіды, драўняныя валокны (*лібрыформ*) і драўняная асн. тканка (*парэнхіма*). Адрозніваюць Д. першасную, якая ўтварае клеткі пракамбію, і другасную (уласна Д., што ўтвараецца камбіем). Штогадовыя прыросты Д. характарызуюцца ўтварэннем *гадавых слаёў* (гл. таксама *Гадавыя кольцы*). У ядравых парод (хвоя, лістоўніца, дуб і інш.) адрозніваюць перыферычную светлую зону (абалону — фізіялагічна актыўную частку, якая праводзіць ваду і мінер. рэчывы) і цэнтр. цёмную зону (ядро, якое ўдзельнічае ў водазабеспячэнні; у клетках некат. парод назапашваюцца смолы, дубільныя рэчывы, алеі, камедзі, пігменты). У бяз'ядравых парод цэнтр. зона такога ж колеру, як абалона (елка, піхта, бяроза, клён і інш.). Элементны хім. састаў сухой Д. розных парод падобны, у ім 49—50% вугляроду, 6—7% вадароду, 43—46% кіслароду, 0,1—0,3% азоту; попелу да 1%, у яго ўваходзяць кальцый, калій, натрый, магній і інш. элементы. Д. розных парод складаецца пераважна з *цэлюлозы* (у хвойных 41—58%, у лісцевых 39—47%), *геміцэлюлозы* (адпаведна 15—23% і 20—38%), *лігніну* (28—34% і 17—27%). Шчыльнасць Д. мяняецца ў шырокіх межах у залежнасці ад віду раслін і ўмоў яе росту. Мікраструктура Д., якая дазваляе вызначыць яе якасць, характарызуецца шырынёй гадавых слаёў, наяўнасцю позняй Д., раўнаслойнасцю, велічынёй і размеркаваннем натуральных няроўнасцей. Д. шырока выкарыстоўваецца ў многіх галінах нар. гаспадаркі на выт-сць цэлюлозы, кардону, паперы, буд. матэрыялаў (гл. *Драўляныя канструкцыі, Драўняныя матэрыялы, Драўнянавалакністыя пліты, Драўнянаслаістыя пластыкі*) і інш., а таксама на паліва. Хім. перапрацоўкай з Д. атрымліваюць дубільныя рэчывы, каніфоль, шкіпінар, флатамасла, харч. глюкозу, драўняны і вінны спірт і інш. *А.К.Фядосаў.*

ДРАЎНІ́ННАЯ СМАЛА́, сумесь арган. рэчываў, якая ўтвараецца пры *піролізе драўніны*. Адрозніваюць адстойную (вылучаецца пры распластаванні вадкага піралізату), растваральную (знаходзіцца ў водным слоі) і экстракцыйную (вылучаюць з воднага слоя арган. растваральнікамі).

Адстойная Д.с. вязкая цёмна-рудая вадкасць з рэзкім пахам, пры перагонцы дае 30—60% дыстыляту, які мае фенолы (50—60%), нейтральныя рэчывы (20—30%), к-ты (5—15%), і 30—50% драўніннага пеку — кубавая астача, у якой 60—80% высокамалекулярных фенолакіслот. Растваральная Д.с. мае вугляводы (25—30%), лактоны гідроксікіслот (да 30%), лятучыя к-ты (10—20%), фенолы і іх вытворныя (15—25%), а экстракцыйная — да 50—60% фенолаў. Выкарыстоўваюць як змякчальнік пры рэгенерацыі гумы, сувязнае для актываваных вуглёў, экстракцыйную — для атрымання паніжальнікаў вязкасці свідравінных растворaў. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ДРАЎНЯНАВАЛАКНІ́СТЫЯ ПЛІ́ТЫ, лісты з буд. матэрыял, адліты з драўнянай масы, часам з дабаўленнем спец. саставаў (сінт. смала, высыхальны алей, клей, бітумная паста і інш.), з далейшым гарачым прасаваннем або сушкай.

Вырабляюцца мокрым (у водным асяроддзі), паўсухім ці сухім спосабамі. Бываюць мяккія, паўцвёрдыя, цвёрдыя і звышцвёрдыя. Вогне-, вода- і біяўстойлівасць Д.п. павышаюць увядзеннем у іх склад вогнетрывалых напаўняльнікаў (напр., валокнаў азбесту), *антыпірэнаў*, насычэннем *антысептычнымі сродкамі*. Выкарыстоўваюцца як аблiцовачны, цеплаізаляцыйны і канструкцыйны матэрыял у буд-ве, мэблевай прам-сці і інш. У Беларусі вырабляюцца з 1936 (звычайныя і пакрытыя эмалямі), даследуюцца ў Бел. тэхнал. ун-це і на прамысл. прадпрыемствах (напр., распрацаваны канструкцыі і тэхналогія вытв-сці аблiцовачных Д.п. — т.зв. фанераізаплiт).

ДРАЎНЯНАСЛАІ́СТЫЯ ПЛА́СТЫКІ, матэрыялы, вырабленыя з лістоў лу-



Да арт. **Драўніна**. Асноўныя часткі ствала і яго галоўныя разрэзы: 1 — кара; 2 — асяродак; 3 — ядро; 4 — абалона; 5 — тангенцыяльны разрэз; 6 — радыяльны разрэз; 7 — папярочны разрэз.

шчанай *шпоны*, укладзеных у пэўным парадку (па напрамку валокнаў) і склееных пад ціскам пры тэрмічнай апрацоўцы. Вызначаюцца высокай шчыльнасцю (да 1300 кг/м^3 і больш). Выкарыстоўваюцца ў машынабудаванні, электратэхніцы, авія- і суднабудаванні.

ДРАЎНЯНАСТРУ́ЖКАВЫЯ ПЛІ́ТЫ, ліставы буд. матэрыял, выраблены гарачым прасаваннем сумесі здробненай драўнянай масы (стружкі) з сінт. смоламі. Сыравіна — адходы дрэваапр. і с.-г. (кастрыца) вытв-сці, недзелавая драўніна, чарот. Бываюць адна- і шматслаёвыя, плоскага і экструзійнага прасавання. Выкарыстоўваюцца як канструкцыйны і аддзелачны матэрыял у буд-ве, вытв-сці мэблі і інш. У Беларусі выпускаюцца з 1960-х г. (у т.л. апрацаваныя сінт. плёнкамі), даследуюцца ў Бел. тэхнал. ун-це і на прамысл. прадпрыемствах.

ДРАЎНЯ́НАЯ МА́СА, валакністая маса, якую атрымліваюць мех. сціраннем *балансавай драўніны* ў *дэфібрэрах* ці трэсак у дэфібратарах. Выкарыстоўваюць як паўфабрыкат у вытв-сці паперы, кардону, драўнянавалакністых пліт.

ДРАЎНЯ́НЫ ВУ́ГАЛЬ, сітаваты высокавугляродзісты прадукт *піролізу драўніны*. З 1 м^3 сыравіны атрымліваюць 140—180 кг Д.в., шчыльнасць якога залежыць ад віду драўніны: найменшая 260 кг/м^3 (елка), найб. 380 кг/м^3 (бяроза). Яго элементны склад вызначаецца т-рай піролізу, напр., прамысл. Д.в. (піроліз пры 450—550 °С) мае 80—92% вугляроду, 4—4,8% вадароду, 5—15% кісларoду. Выкарыстоўваюць у вытв-сці актыўнага вугалю, крышт. крэмнію, серавадароду, як паліва ў побыце (цеплата згарання 30—35 МДж/кг).

ДРАЎНЯ́НЫ СПІРТ, гл. *Метылавы спірт*.

ДРАЎНЯ́НЫЯ ВАЛО́КНЫ, тое, што *лібрыформ*.

ДРАЎНЯ́НЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ, канструкцыйныя, ізаляцыйныя і вырабныя матэрыялы, поўнасцю або часткова атрыманыя шляхам апрацоўкі і склейвання натуральнай *драўніны*, драўняных часціц, валокнаў, *шпону*.

Да Д.м. адносяцца матэрыялы з драўніны, выраблены прасаваннем (пад ціскам да 30 МПа) пры павышаных т-рах, насычэннем (змешваннем) сінт. смоламі, аміякам, цэм. растворам і інш., склейваннем, адліўкай, інш. спосабамі (гл. *Арбаліт*, *Драўнянавалакністыя пліты*, *Драўнянастружкавыя пліты*, *Драўняныя пластыкі*, *Драўнянаслаістыя пластыкі*, *Дрэвашклапластыкі*, *Фанера*, *Фібраліт*). Маюць добрыя эксплуатацыйныя якасці, выкарыстоўваюцца ў буд-ве (гл. *Драўляныя канструкцыі*), мэблевай прам-сці, судна- і машынабудаванні і інш. Гл. таксама *Дрэваапрацоўчая прамысловасць*.

ДРАЎНЯ́НЫЯ ПЛА́СТЫКІ, матэрыялы, якія атрымліваюць з лушчанай шпоны, драўнянай крошкі, трэсак або пілавіння, насычаных сінт. смоламі і склееных пад высокімі ціскам і тэмпературай. Падзяляюцца на *драўнянаслаістыя пластыкі* (лігнафоль, дэльта-драўніна і інш.), арміраваныя, спрасаваныя і склееныя са шпоны і тканіны, узмоцненыя метал. сеткай, фольгай і інш., драўнянапластычныя масы — профільныя (утулкі, падшыпнікі, зубчастыя колы) і плітачныя (паркетныя пліткі і інш.) вырабы, атрыманыя прасаваннем у гарачых прэс-формах са здробненай драўніны або пілавіння. Выкарыстоўваюцца як канструкцыйны, электраізаляцыйны, сценавы і вырабны матэрыял.

ДРАФІ́НЫЯ (Otididae), сямейства птушак атр. журавлепадобных. 11 родаў, 24 віды. Пашыраны ў стэпах і паўпустынях Афрыкі, Еўразіі і Аўстраліі. Найб. вядомыя: драфа звычайная (Otis tarda), стрэпет (Tetrax tetrax), джэк, або драфа-красуня (Chlamydotis undulata). На Пд Бе-



Драфіныя: 1 — драфа звычайная; 2 — джэк; 3 — стрэпет.



Схема мікраскапічнай будовы драўніны: I — хвоі (1 — гадавы слой; 2 — стрыжнёвыя прамяні; 3 — вертыкальны смаляны ход; 4 — раннія трахеіды; 5 — позняя трахеіда; 6 — аблямаваная пора; 7 — прамянёвая трахеіда); II — дуба (1 — гадавы слой; 2 — сасуды; 3 — буйны сасуд ранняй драўніны; 4 — дробны сасуд позняй драўніны; 5 — шырокі стрыжнёвы прамень; 6 — вузкія стрыжнёвыя прамяні; 7 — лібрыформ).

ларусі раней траплялiся драфа звычайная (нар. назвы дроп, крохва), занесеная ў Чырв. кнігу (1-е выд.), і стрэпет.

Вялікія і сярэдніх памераў птушкі, маса 1—23 кг. Самцы большыя за самак. Апярэнне шчыльнае, разнастайнай афарбоўкі. Шыя сярэдняй даўжыні, тоўстая. Ногі моцныя, доўгія, трохпальцыя, з цвёрдымі мазолістымі падушачкамі. Хвост кароткі. У шлюбны перыяд самцы такуюць. Гняздо на зямлі, нясуць 2—5 яец. Корм разнастайны, пераважна раслінны. Ахоўваюцца, разводзяцца штучна.

ДРА́ХЕНЛОХ (Drachenloch), пячора ва ўсх. ч. Швейц. Альп, на Пд ад Бодэнскага воз. (Швейцарыя). Размешчана на выш. 2445 м. У мусцьерскую эпоху была месцам пражывання паляўнічых-неандэртальцаў (больш за 50 тыс. г. таму назад). У Д. выяўлены рэшткі вогнішча, каменныя і касцяныя прылады, шматлікія косці пячорнага мядзведзя і складзеныя з вапняковых пліт «скрыні», у якіх, верагодна, захоўвалі найб. каштоўныя часткі мядзведжых туш.

ДРА́ХМА, 1) адзінка масы ў сістэме англ. мер, складае $^1/_6$ *унцыі* і роўная 1,772 г. 2) Адзінка масы *аптэкарскай вагі*; аптэкарская Д. складала $^1/_8$ унцыі, або 3 *скрупулы*, рас. аптэкарская Д.=3,732 г, у англ. сістэме мер аптэкарская Д.=3,888 г. 3) Вадкасная Д. (ЗША) — мера і адзінка ўмяшчальнасці, роўная 3,6966 мл.

ДРА́ХМА (ад грэч. drachmē жменя, кісць), 1) старажытнагрэчаская вагавая і грашовая адзінка. Як манета пачала чаканіцца ў 6 ст. да н.э. Была пераважна сярэбранай, радзей залатой ці меднай, мела розную масу (атычная Д. 4,17 г; карынфская Д. 2,8 г). Чаканіліся манеты вартасцю $^1/_2$, 1, 2 (дыдрахма), 3, 4 (тэтрадрахма), 5, 6, 8, 10 (дэкадрахма) і 12 Д.; раўнялася 6 *аболам*, 100 Д. складалі міну, 6 тыс. Д. — талант. 2) У сярэдневякоўі сярэбраная манета масай 2,7 г. Чаканілася ў сярэдзіне 13 ст. ў лац. дзяржавах Б. Усходу. 3) Сучасная грашовая адзінка Грэцыі (з 1833).

Н.К.Мазоўка.

ДРАЦЭ́НА (Dracaena), род кветкавых раслін сям. драцэнавых. Каля 150 відаў. Пашыраны ў тропіках і субтропіках Усх. паўшар'я. Растуць на горных схілах, у прыбярэжных вільготных лясах. На Беларусі ў аранжарэях і пакоях вырошчваюць Д. пахучую (D. fragrans), стракаталістую, дзярэмскую (D. deremensis), зеленалістую Гукера (D. hookeriana).

Шматгадовазялёныя дрэва- і кустападобныя расліны. Лісце сядзячае, падоўжана-ланцэтападобнае, скурыстае, цвёрдае, зялёнае, шэра-зялёнае або стракатае. Кветкі правільныя, двухполыя, звычайна белыя, крэмаватыя, жаўтаватыя або ружовыя, пахучыя, сабраны на верхавінках у мяцёлкі або пучкі. Плод — ягада. Цвітуць рэдка. Размнажаюць насеннем, верхавінкавымі або сцябловымі чаранкамі. Тэхн. (лаканосныя, фарбавальныя, валакністыя), лек. і дэкар. расліны. Некаторыя дрэвападобныя віды Д., у якіх з надрэзаў кары выцякае крывава-чырв. смаляністы сок, наз. *драконавым дрэвам.*

Г.У.Вынаеў.

ДРАЦЯ́НІКІ, драцяныя чэрві, лічынкі жукоў сям. шчаўкуноў; шкоднікі многіх с.-г. і дзікарослых раслін. На Беларусі найб. пашыраны лічынкі шчаўкуноў цёмнага, пасяўнога, паласатага, бліскучага, вярбовага. Шкодзяць цукр. буракам, бульбе, кукурузе, пшаніцы, жыту, агароднінным культурам, маладым хвойнікам і ельнікам, саджанцам пладовых дрэў.

Цела Д. даўж. 15—45 мм, тонкае, цыліндрычнае (радзей плоскае), падобнае на кавалачкі дроту (адсюль назва); складаецца з 13

Драцэна дзярэмская.

сегментаў, укрытых шчыльным хіцінам; напачатку белае, потым жаўтаватае, бурае, карычневае. Жывуць у глебе, часцей на глыб. 10—12 см, развіваюцца 3—5 гадоў. Кормяцца насеннем у глебе, падземнымі часткамі раслін, раслінными і жывёльнымі рэшткамі, некаторыя з'яўляюцца драпежнікамі.

ДРАЧ, дзяркач (Стех стех), птушка сям. пастушковых атр. жураўлепадобных. Пашыраны па ўсёй Еўропе, Зах. Азіі (да Байкала). Жыве на вільготных травяністых лугах, у пасевах с.-г. культур, на лясных высечках, агародах. На Беларусі звычайны пералётны від (нар. назвы дзяргач, дзяргун). Актыўны пераважна ўначы.

Даўж. цела 18—27 см, маса 100—200 г. Афарбоўка светла-рыжая з цёмнымі стракацінамі. Дзюба кароткая, моцная. Бегае хутка. Вясной самец выдае моцныя скрыпучыя гукі (адсюль назва). Гняздуецца парамі. Гняздо — ямка пад кустом або на купіне. Нясе 7—12 яец. Птушаняты ўкрыты чорна-бурым пухам. Корміцца насякомымі, смаўжамі, дажджавымі чарвякамі, насеннем пустазелля і інш. Аб'ект палявання. Зімуе ў Афрыцы і Міжземнамор'і.

Драч.

Да арт. **Драцянікі**. Жук і лічынкі паласатага шчаўкуна.

ДРАЧ Іван Фёдаравіч (н. 17.10.1936, с. Цялежынцы Таціеўскага р-на Кіеўскай вобл.), украінскі паэт. Скончыў Кіеўскі ун-т (1962), Вышэйшыя сцэнарныя курсы (Масква, 1964). Філасафічнасць, асацыятыўна-ўмоўная вобразнасць, метафарычнасць — рысы паэзіі Д. (зб-кі «Сланечнік», 1962, «Балады будняў», 1967; «Корань і крона», 1974, Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1976; «Зялёныя вароты», 1980, Дзярж. прэмія СССР 1983; «Пісьмо да каліны», 1990, і інш.). Пераклаў на ўкр. мову вершы Р.Барадуліна, А.Бачылы, Г.Бураўкіна, Н.Гілевіча, А.Звонака, М.Танка. На бел. мову вершы Д. перакладалі Барадулін, Бураўкін, А.Вярцінскі, Гілевіч, А.Грачанікаў, У.Караткевіч, Я.Сіпакоў і інш.

Тв.: Вибр. твори. Т. 1—2. Київ, 1986; Бел. пер. — Мелодыя каліны. Мн., 1981.

Літ.: Ткаченко А.О. Іван Драч. Київ, 1988.

В.А.Чабаненка.

ДРА́ЧКАВА, вёска ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., каля р. Вожа, на аўтадарозе Смалявічы—Смілавічы. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 26 км на Пд ад горада і чыг. ст. Смалявічы, 40 км ад Мінска. 924 ж., 317 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — Казьмадзям'янаўская царква (19 ст.).

ДРАЧО́Ў Пётр Мікалаевіч (н. 6.7.1937, С.-Пецярбург), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1964). У 1964—86 маст. рэдактар час. «Бярозка», з 1992 у

«Беларускім гістарычным часопісе». Працуе ў кніжнай і станковай графіцы. Сярод твораў: серыя акварэлей «Помнікі архітэктуры Беларусі» (1970—82), «Бярэзінскі запаведнік» (1975—79), літаграфіі «Кірмаш канца XIX — пач. XX ст.» (1972), «Дзяды» паводле паэмы А.Міцкевіча (1973), «Паўстанне 1863 г.» (1978), «Спынім забойствы...» да 500-годдзя Міколы Гусоўскага (1980), серыя «Асветнікі» (1989), ілюстрацыі да кніг У.Дубоўкі, П.Броўкі, У.Караткевіча, І.Новікава; дыярамы «На старажытным гарадзішчы», «Францыск Скарына трымае экзамен перад прафесарамі ў

П.**Драчоў**. Кірыла Тураўскі. З серыі «Асветнікі». 1989.

Падуанскім універсітэце», «Знахаркі» і інш. для Музея гісторыі медыцыны Беларусі; «Гандаль у Полацку», «Падводны свет нашых азёр», «Паселішча на Сенніцы», «Крэменездабыўныя шахты ў Красным», «Францыск Скарына ў друкарні» і панарама «Пажар г. Магілёва ў 1700—21 гг.» для Нац. музея гісторыі і культуры Беларусі, «Мінск у 1890 г.» для Музея М.Багдановіча (1992—93, усе ў Мінску).

ДРАЧО́Ў Уладзімір Карпавіч (14.7.1926, г. Рагачоў Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне эканомікі. Д-р эканам. н. (1977), праф. (1979). Засл. дз. н. Латвіі (1986). Скончыў Ленінградскі дзярж. ун-т (1957). З 1968 у Мінскім радыётэхн. ін-це, з 1969 у БДУ (у 1971—78 заг. кафедры палітэканоміі). У 1978—92 заг. кафедры палітэканоміі Рыжскага ін-та інжынераў грамадз. авіяцыі. З 1992 на прамысл. прадпрыемствах Рэчыцы. Даследуе тэарэтыка-метадалагічныя праблемы фарміравання эканам. свядомасці, методыкі выкладання і вывучэння эканам. тэорыі ў ВНУ, метады эканоміка-матэм. аналізу работы прамысл. прадпрыемстваў.

Тв.: Экономическое сознание как фактор развития общественного производства при социализме (методологический анализ). Мн., 1977; Экономические знания — наука и идеология. Рига, 1988.

ДРОБ у арыфметыцы, лік, які змяшчае адну ці некалькі доляў (роўных частак) адзінкі. Абазначаецца сімвалам $\frac{a}{b}$ (або a/b), дзе a — лічнік, які паказвае колькасць доляў адзінкі, падзеленай на столькі частак, колькі паказвае (называе) назоўнік b (a і b) — цэлыя лікі). Д. a/b можна таксама разглядаць як вынік дзялення ліку a на лік b; калі a дзеліцца нацэла на b, то дзель — цэлы лік (напр., 6/3 - 2; 28/7 - 4), калі не дзеліцца — дробавы (напр., 3/7; 20/12).

Д. $\frac{a}{b}$ наз. правільным, калі $a < b$, і няправільным, калі $a > b$. Няправільны Д. можна запісаць у выглядзе сумы цэлага ліку і правільнага Д. (змешаны лік); для гэтага патрэбна лічнік падзяліць з астачай на назоўнік, напр., $\frac{67}{13}=\frac{5\cdot 13+2}{13}=5+\frac{2}{13}=5\frac{2}{13}$. Множанне і дзяленне Д. выконваюць па правілах: $\frac{a}{b}\cdot\frac{c}{d}=\frac{a\cdot c}{b\cdot d}$; $\frac{a}{b}:\frac{c}{d}=\frac{a\cdot d}{b\cdot c}$, суму (рознасць) Д. $\frac{a}{b}$ і $\frac{c}{b}$ з аднолькавымі назоўнікамі — па правілах $\frac{a}{b}\pm\frac{c}{b}=\frac{a\pm c}{b}$. Д. $\frac{a}{b}$ не зменіцца, калі лічнік і назоўнік памножыць на адзін і той жа лік, адрозны ад нуля. Таму Д. $\frac{a}{b}$ і $\frac{c}{d}$ можна прывесці да агульнага назоўніка (замяніць на роўныя ім Д. з аднолькавымі назоўнікамі, звычайна роўнымі найменшаму агульнаму кратнаму b і d). Калі лічнік і назоўнік маюць агульныя множнікі, Д. можна надаць нескарачальны від, напр., $\frac{14}{35}$ — скарачальны ($\frac{14}{35}=\frac{2\cdot 7}{5\cdot 7}=\frac{2}{5}$), а $\frac{25}{84}$ — нескарачальны Д. Гл. таксама *Дзесятковы дроб*, *Дробавая і цэлая часткі ліку*.

А.А.Гусак.

ДРО́БАВА-ЛІНЕ́ЙНАЯ ФУ́НКЦЫЯ, дзель двух *лінейных функцый*. Выражаецца формулай $y=\frac{ax+b}{cx+d}$, дзе a, b, c, d — пастаянныя і $ad - bc \neq 0$; самая простая сярод *рацыянальных функцый*. Пры рэчаісных значэннях x і $c \neq 0$, графікам Д.-л. ф. будзе роўнабаковая гіпербала з асімптотамі $y = a/c$ і $x = -d/c$ і цэнтрам у пункце $(-d/c, a/c)$.

Калі x прымае адвольныя камплексныя значэнні (a, b, c, d — камплексныя лікі), Д.-л.ф. ажыццяўляе ўзаемна адназначнае і *канформнае адлюстраванне* камплекснай плоскасці (разам з пунктам ∞) на сябе, якое наз. дробава-лінейным адлюстраваннем. Напр., Д.-л.ф. пераводзіць прамыя і акружнасці зноў у прамыя і акружнасці, верхнюю паўплоскасць — на круг.

ДРО́БАВАЯ І ЦЭ́ЛАЯ ЧА́СТКІ ЛІ́КУ, складаемыя, на якія адзіна магчымым спосабам раскладаецца любы рэчаісны лік. Цэлай часткай $[x]$ ліку x наз. найб. цэлы лік, які не перавышае x, напр., $[5, 6] = 5$, $[-3, 2] = -4$; з яе дапамогай атрымліваюць, напр., раскладанне на простыя множнікі ліку $n! = 1\cdot 2\cdot 3\ldots\cdot n$. Функцыя $y = [x]$ — кавалкава неперарыўная (ступеньчатая) функцыя са скачкамі ў цэлых пунктах. Дробавая частка $\{x\}$ ліку x — рознасць $x - [x]$; заўсёды $0 \le \{x\} < 1$; функцыя $y = \{x\}$ — перыядычная функцыя з перыядам, роўным 1. З дробавай часткай звязана паняцце адлегласці да бліжэйшага цэлага ліку x [абазначаецца (x)]: $(x) = \min |x-k|$, дзе $k = 0, \pm 1, \pm 2\ldots$ Гэтыя паняцці выкарыстоўваюцца ў тэорыі лікаў і інш. раздзелах матэматыкі.

В.І.Бернік.

Л.Н.**Дробаў**.

ДРО́БАЎ Леанід Ніканоравіч (н. 6.8.1926, в. Растаў Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.), бел. мастацтвазнавец і жывапісец. Д-р мастацтвазнаўства (1984), праф. (1987). Скончыў БДУ (1958), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). З 1964 заг. аддзела выяўл. мастацтва Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі. Даследуе бел. жывапіс 19—20 ст. Аўтар кніг па гісторыі бел. жывапісу, манаграфій пра бел. мастакоў А.Мазалёва (1976), А.Шаўчэнку (1980); рэдактар і аўтар асобных артыкулаў у «Гісторыі мастацтва народаў СССР» (т. 5—9, 1972—82; залаты медаль АМ СССР, 1982), «Гісторыі бела-

Л.**Дробаў**. Крым. Гурзуф. 1970-я г.

рускага мастацтва» (т. 1—6, 1987—94; Дзярж. прэмія Беларусі 1996). Аўтар сюжэтна-тэматычных работ «Камбед» (1968), «Партызанская кухня» (1965), «Аўтапартрэт» (1972), «Успаміны аб юнацтве» (1973), «Прэлюдыя» (1983), партрэтаў П.Ф.Глебкі (1971), «Групавы партрэт беларускіх пісьменнікаў» (1987), пейзажаў «Крым. Гурзуф» (1970-я г.), «Роднае Палессе», «На рацэ Пціч», «Старая дарога на Парэчча», серыі «Міншчына», «Віцебшчына» (усе 1990-я г.) і інш.

Тв.: Беларускія мастакі XIX ст. Мн., 1971; Искусство Белорусской ССР: [Альбом]. Л., 1972; Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974; Живопись Советской Белоруссии (1917—1975 гг.). Мн., 1979; Сучасны беларускі партрэт. Мн., 1982.

Літ.: Фатыхава Г. Дарога за небакрай // Мастацтва Беларусі 1988. № 5.

Г.А.Фатыхава.

ДРОБНАСЕРЫ́ЙНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, від серыйнай вытв-сці, пры якой прадукцыя выпускаецца дробнымі серыямі. Да Д.в. адносяць вытв-сць некат. відаў пракату, невял. партый вырабаў, машын і інш.

ДРОБНАТАВА́РНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, гл. ў арт. *Таварная вытворчасць*.

ДРО́БЫШ Станіслаў Іосіфавіч (н. 17.3.1939, в. Заграддзе Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. харавы дырыжор, педагог. Засл. работнік культуры Беларусі (1975). Скончыў Бел. кансерваторыю (1972). З 1977 выкладае ў Бел. унце культуры (з 1981 заг. кафедры, з 1994 праф.). Адначасова ў 1964—93 кіраўнік Мінскага нар. хору Палаца культуры вытв. буд.-мантажнага аб'яднання «Мінскпрамбуд», арганізатар (1979) і кіраўнік фальклор. вак.-харэаграфічнага ансамбля «Валачобнікі» ун-та культуры, з 1993 — Мінскага нар. хору Палаца культуры прафсаюзаў, якія пад яго кіраўніцтвам дасягнулі значнага выканальніцкага майстэрства. За час працы з калектывамі падрыхтаваў больш за 40 канцэртных праграм, у т.л. некалькі тэматычных, якія ўключаюць бел. нар. песні (у т.л. а капэла), песні бел. і інш. кампазітараў. Яму ўласцівы беражлівыя адносіны да нар. песні, пошук сродкаў яе захавання ў варыянце, блізкім да аўтэнтычнага.

А.Ш.Раецкі.

ДРО́ГАВА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дражбітка (цячэ праз возера), за 36 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 0,28 км^2, даўж. 850 м, найб. шыр. 420 м, даўж. берагавой лініі больш за 2 км. Схілы катлавіны невыразныя. Берагі забалочаныя.

ДРО́ЖДЖЫ, група аднаклетачных мікраскапічных грыбоў, у якіх адсутнічае сапраўдны міцэлій. Вядома каля 500 відаў, што належаць да 3 класаў — *аскаміцэты, базідыяльныя грыбы* і *недасканалыя грыбы* (дэйтэраміцэты). Пашыраны ў глебе, прадуктах, у раслін, жывёл і чалавека. Клеткі Д. шарападобнай, авальнай або цыліндрычнай формы, бясколерныя ці пігментаваныя, нерухомыя, даўж. 5—10 мкм і больш. Размнажаюцца пераважна пачкаваннем, некат. віды — дзяленнем. Д. ўдзельнічаюць у кругавароце рэчываў у глебе, фарміраванні яе структуры і ўрадлівасці. Многія выклікаюць спіртавое *браджэнне*. Багатыя бялком, вітамінамі групы В. Выкарыстоўваюцца ў вінаробстве, піваварэнні, хлебапячэнні, сельскай гаспадарцы (гл. *Дрожджы кармавыя, Дражджавая вытворчасць*) і інш.; піўныя Д. — у медыцыне пры гіпавітамінозе B_1, парушэннях абмену рэчываў, фурункулёзе і інш. Патагенныя формы Д. выклікаюць хваробы чалавека і жывёл — бластамікозы, кандыдамікозы.

А.П.Красільнікаў.

ДРО́ЖДЖЫ КАРМАВЫ́Я, від *дражджэй*, што атрымліваюць на корм с.-г. жывёле. Вырошчваюць іх на адходах драўніны, кукурузнай аснове, саломе, шалупінні сланечніку, а таксама на адходах сульфітна-цэлюлознай і спіртавой вытв-сці. Д.к. — каштоўны бялкова-вітамінны корм для с.-г. жывёлы ўсіх відаў, маюць вітаміны групы В, правітамін D (эргастэрын), мінер. рэчывы, ферменты, гармоны, якія садзейнічаюць засваенню бялкоў і вугляводаў. Скормліваюць іх з канцэнтраванымі кармамі або ўключаюць у склад камбікармоў.

В.П.Дрозд.

М.П.Дрозд.

ДРОЗД Валянцін Пятровіч (16.9.1906, г. Буда-Кашалёва Гомельскай вобл. — 29.1.1943), віцэ-адмірал (1941). Скончыў Вышэйшае ваенна-марское вучылішча імя Фрунзе (1928), служыў на караблях Балт. флоту (БФ). Удзельнік грамадз. вайны ў Іспаніі (інструктар-саветнік рэсп. флоту ў 1936—37). З 1938 камандуючы Паўн. флотам, удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. З вер. 1940 нач. Чарнаморскага вышэйшага ваен.-марскога вучылішча. З лют. 1941 камандзір атрада лёгкіх сіл БФ, у пач. Вял. Айч. вайны на чале атрада караблёў БФ прарваўся з Таліна ў Кранштат. З вер. 1941 камандуючы эскадрай караблёў БФ; удзельнік абароны Маанзундскіх а-воў, эвакуацыі абаронцаў п-ва Ханка, абароны Ленінграда. Загінуў на лядовай трасе пад Кранштатам. Яго імем названы эсмінец БФ (гл. *«Віцэ-адмірал Дрозд»*) і вял. процілодачны карабель Паўн. флоту. У Буда-Кашалёве помнік.

Р.К.Паўловіч.

ДРОЗД Лявонцій Мікалаевіч (24.1.1921 г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 1.6.1982), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Канд. пед. н. (1958), праф. (1978). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1952). З 1956 у Гродзенскім пед. ін-це (з 1958 прарэктар). У 1962—80 у Мінскім пед. ін-це (з 1967 заг. кафедры педагогікі). Даследаванні па гісторыі педагогікі і гісторыі агульнаадук. школы Беларусі, дыдактыцы і тэорыі выхавання, праблемах педагогікі вышэйшай школы.

Тв.: Развитие средней общеобразовательной школы в Белоруссии, 1917—1941. Мн., 1986; Асвета ў БССР у перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі і стварэння фундаменту сацыялізма (1921—1931 г.) // Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968; Развитие педагогической науки в БССР: Краткий обзор (1919—1979) // Педагогика: Вопр. истории школы и пед. мысли в БССР. Мн., 1980. Вып. 18.

ДРОЗД Мікалай Пракопавіч (падп. псеўд. Дзядзька Вася; 1890, в. Селішча Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. — 1943), удзельнік *Мінскага патрыятычнага падполля* ў Вял. Айч. вайну. З 1939 працаваў на лямцавай ф-цы «Чырвоны Кастрычнік». У час акупацыі Мінска ням.-фаш. захопнікамі арганізаваў і ўзначаліў падп. групу. На яго кватэры захоўваліся зброя, боепрыпасы, медыкаменты, хаваліся падпольшчыкі і ваеннаслужачыя, якія трапілі ў акружэнне, у 1941 адбыліся 2 пасяджэнні Мінскага падп. гаркома КП(б)Б. Д. удзельнічаў у аперацыі па знішчэнні В.Кубэ. 24.9.1943 Д., яго жонка і дачка Рэгіна арыштаваны і пасля катаванняў загублены ў Трасцянецкім лагеры смерці.

ДРОЗД Станіслаў Сцяпанавіч (н. 5.1.1936, в. Пушча Лагойскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны эканаміст. Канд. эканам. н. (1974). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1958), Акадэмію нар. гаспадаркі пры Саўміне СССР (1985). У 1978—83 дырэктар Гомельскага з-да пускавых рухавікоў, у 1984—87 у Мін-ве трактарнага і с.-г. машынабудавання. У 1987—92 — ген. дырэктар ВА «Гомсельмаш». З 1993 у Гомельскім політэхн. ін-це, з 1995 праф., заг. кафедры эканомікі і кіравання прамысл. прадпрыемствам. Даследуе праблемы павышэння эфектыўнасці вытв-сці на прадпрыемствах трактарнага і с.-г. машынабудавання. Аўтар навук. прац, навуч. і навуч.-метадычных дапаможнікаў па эканам. і сац. праблемах.

Тв.: Хозяйственный расчет и стимулы на промышленном предприятии. Мн., 1972 (у сааўт.); Проблемы стабилизации трудовых коллективов. Мн., 1982 (у сааўт.).

ДРОЗДАПАДО́БНАЯ ЧАРАЦЯ́НКА, птушка, гл. ў арт. *Чарацянкі*.

ДРО́ЙЗЕН (Droysen) Іаган Густаў (6.7.1808, г. Трэптаў, цяпер г. Тшабятаў, Польшча — 19.6.1884), нямецкі гісторык. Праф. Берлінскага (у 1835—40 і з 1859), Кільскага (з 1840) і Іенскага (з 1851) ун-таў. Удзельнік антыдацкага паўстання ў Шлезвіг-Гольштэйне і чл. Франкфурцкага парламента ў Рэвалю-

цыю 1848—49 у Германіі, выступаў за аб'яднанне герм. зямель вакол Прусіі. Увёў у гіст. навуку паняцце *эллінізм* (разумеў яго як працэс «распаўсюджвання грэч. дзяржаўнасці і адукаванасці» сярод стараж.-ўсх. народаў). Заснавальнік пруска-малагерм. гіст. школы. Аўтар прац «Гісторыя Аляксандра Вялікага» (1833), «Гісторыя эліпізму» (т. 1—2, 1836—43; 2 выд., т. 1—3, 1877—78), «Гісторыя прускай палітыкі» (т. 1—14, 1855—86) і інш.

Тв.: Рус. пер. — История эллинизма. [Т.] 1—3. Ростов на/Д. 1995.

ДРОК Косць (Канстанцін Леанідавіч; 22.4.1919, г. Луганск, Украіна — 22.5.1996), украінскі паэт. Скончыў Днепрапятроўскі ун-т (1941). Друкаваўся з 1938. У зб-ках «Насустрач сонцу» (1953), «Дняпроўскія мелодыі» (1956), «Мелодыі жыцця» (1972), «Пад ветразямі гадоў» (1978), «Сцвярджэнне» (1990) і інш. роздум пра чалавечы лёс у складаных умовах рэчаіснасці 20 ст. Пісаў творы для дзяцей (зб. «Хочаш ведаць пра Карпаты», 1954). Пераклаў на ўкр. мову паасобныя вершы Я.Купалы, К.Кірэенкі. *В.А.Чабаненка.*

ДРО́НАЎ Фёдар Амосавіч (18.5.1925, г. Крамянчуг, Украіна — 4.7.1994), бел. вучоны-эканамісг. Чл.-кар. АН Беларусі (1986), д-р эканам. н. (1976), праф. (1979). Засл. эканаміст Беларусі (1985). Скончыў Ленінградскі фін.-эканам. ін-т (1954). З 1964 у Ін-це эканомікі АН Беларусі (з 1968 нам. дырэктара). У 1980—88 дырэктар Н.-д. эканам. ін-та Дзяржэканомплана. Навук. працы па сац.-эканам. праблемах навук.-тэхн. прагрэсу і эфектыўнасці вытв-сці.

Ф.А.Дронаў.

Тв.: Научно-технический прогресс и проблемы ускорения экономического роста. Мн., 1979; Проблемы интенсификации промышленного производства. Мн., 1979 (у сааўт.); Интенсификация в условиях научно-технического прогресса. М., 1986.

ДРО́НТАВЫЯ (Raphidae), сямейства птушак атр. голубападобных. 2 роды, 3 віды: дронт звычайны, або дода (Raphus cucullatus), белы (R. apterornis) і пустэльнік (Pezophaps solitaria). Вынішчаны паляваннем, завезенымі свойскімі жывёламі і макакамі. Былі пашыраны на Маскарэнскіх а-вах (Індыйскі ак.), дода на в-ве Маўрыкій (апошнія звесткі ў 1681), белы на в-ве Рэюньён (вымер каля 1750), пустэльнік на в-ве Радрыгес (канец 18 ст.). У некат. музеях (Оксфард, Капенгаген, Масква і інш.) збераглісся шкілеты і асобныя часткі цела пераважна доды.

Маса да 20 кг (дода). Галава вял., дзюба кручкаватая. Крылы маленькія, пер'е кароткае. 4 пальцы. Несці 1 яйцо. Расліннаедныя.

ДРО́СЕЛЬ (нам. Drossel), 1) прыстасаванне, якое звужае паток вадкасці, пары ці газу ў трубаправодах. Выкарыстоўваецца для вымярэння і рэгулявання ціску і расходу гэтых рэчываў (дросельныя расходамеры, дыяфрагмы, соплы і інш.), а таксама для рэгулявання гаручай сумесі ў рухавіках унутр. згарання (дросельныя клапаны, засланкі). 2) Шпуля з вял. індуктыўным супраціўленнем (гл. *Індуктыўнасці шпуля*).

ДРО́ЦІК (ад грэч. dorotos кап'ё), кароткае кідальнае *кап'ё*. Вядомы з эпохі верхняга палеаліту (з каменным або касцяным наканечнікам; выкарыстоўваўся як паляўнічая зброя), асабліва ў аўстрал. абарыгенаў і алеутаў. У старажытнасці служыў зброяй першага ўдару ў арміях Грэцыі і Рыма (з жал. наканечнікам). Для павелічэння далёкасці і сілы кідка (да 70—80 м) выкарыстоўвалася раменная пятля. У сярэднія вякі быў пашыраны (з жал. наканечнікам) у Зах. і Усх. Еўропе (на Русі наз. суліца; упершыню згадваецца ў 12 ст. ў «Слове пра паход Ігаравы»).

ДРУ (Drew) Джон (13.11.1853, Нью-Йорк — 9.7.1927), амерыканскі акцёр. Сцэн. дзейнасць пачаў у т-ры «Арч-стрыт». У 1875—92 у трупе антрэпрэнёра О.Дэйлі (Нью-Йорк), адзін з вядучых акцёраў трупы. Яго ігра вызначалася вытанчанасцю манер, лёгкасцю і шчырасцю. Сярод роляў: Розенкранц, Петручыо («Гамлет», «Утаймаванне свавольніцы» У.Шэкспіра), гаспадар гасцініцы («Рып Ван Вінкль» паводле У.Ірвінга). З 1892 выступаў у якасці «зоркі» ў гастрольных трупах.

ДРУГАСНАЕ КВАНТАВА́ННЕ, метад апісання квантавых сістэм з вял. пераменнай колькасцю часціц, у якім ролю незалежных пераменных *хвалевых функцый* выконваюць лікі часціц у індывід. станах асобнай часціцы (т.з. лікі запаўнення).

Д.к. распрацавана П.*Дзіракам* для базонаў (1927) і незалежна Ю.*Вігнерам* і ням. фізікам П.Іорданам для ферміёнаў (1928). Д.к. дасягаецца ўвядзеннем *аператараў*, што павялічваюць (аператары нараджэння) або памяншаюць (аператары знікнення) лік часціц у вызначаным стане на 1. Матэм. ўласцівасці такіх аператараў устанаўліваюцца перастановачнымі суадносінамі (камутантамі), выгляд якіх вызначаецца спінам часціцы (відам *квантавай статыстыкі*). Пры такім падыходзе хвалевая функцыя сама становіцца аператарам. Д.к. выкарыстоўваецца ў квантавай тэорыі поля. *А.І.Болсун.*

ДРУГАСНАЯ СЫРАВІ́НА, адходы жыццезабеспячэння і жыццядзейнасці грамадства, якія пасля адпаведнай апрацоўкі могуць выкарыстоўвацца як вытв. або энергет. сыравіна. Уключае адходы прамысл. вытв-сці, буд-ва (рэшткі металаў, драўніны, шкла), прамысл. вырабаў (брак дэталей, зношаныя аўтапакрышкі), бытавыя (макулатура) і інш.

Неабходнасць выкарыстання Д.с. абумоўлена неўзнаўляльным памяншэннем карысных выкапняў і сыравінных энерганосьбітаў, абмежаванасцю самааднаўлення арган. матэрыялаў расліннага паходжання, таксама эфектыўнасцю. Напр., кошт выплаўкі сталі з металалому ў 10 разоў меншы, чым з руды, медзі — у 5, алюмінію — у 6, прычым затраты эл. энергіі ў 25 разоў; з 1 т косці атрымліваюць 160 кг клею, 110 кг тэхн. тлушчу і 420 кг касцявой мукі.

У Беларусі нарыхтоўкай Д.с. (гл. табл.) займаюцца канцэрн «Белдругрэсурсы» і «Белкаапсаюз», перапрацоўкай — розныя прадпрыемствы і з-ды, у т.л. Жлобінскі металургічны, Магілёўскія рэгенератарны і жэлацінавы, Слонімскі кардонна-папяровы «Альберцін», будматэрыялаў «Даманава» і інш. *А.А.Саламонаў, Я.П.Мініна.*

Аб'ёмы нарыхтоўкі некаторых відаў другаснай сыравіны ў Беларусі

Гады	Від другаснай сыравіны		
	Драўнінныя адходы шчыльныя м^3	Макулатура, тыс. т	Шыны зношаныя тыс. т
1990	2161,7	261	33,7
1995	719,8	93	4,8
1996	792,1	100,2	4



Да арт. **Дронтавыя**. Дронт звычайны, або дода.

ДРУГАСНАЯ ЭЛЕКТРО́ННАЯ ЭМІ́СІЯ, выпрамяненне электронаў цвёрдымі і вадкімі целамі (эмітэрамі) пры іх бамбардзіроўцы першаснымі электронамі. Паток другасных электронаў складаецца з прутка і няпрутка адбітых першасных электронаў і ўласна другасных электронаў, выбітых з эмітэра. Выкарыстоўваецца для ўзмацнення электронных патокаў (напр., у фота-

электронных памнажальніках), узнаўлення інфармацыі ў сістэмах электрастатычнага запісу, атрымання газавага разраду ў прыладах з халодным катодам і інш.

ДРУ́ГАСНЫЯ ДАХО́ДЫ, даходы фіз. і юрыд. асоб, атрыманыя не ў сферы матэрыяльнай вытв-сці.

ДРУ́ГАСНЫЯ ПАЛАВЫ́Я ПРЫКМЕ́ТЫ, сукупнасць асаблівасцей ці прыкмет, што адрозніваюць адзін пол ад другога (за выключэннем першасных палавых прыкмет). Па стадыях развіцця адрозніваюць генетычны (храмасомны), ганадны, саматычны (фенатып) і псіхасексуальны пол. Развіццё Д.п.п. адбываецца ў перыяд палавога выспявання чалавека: у мужчын — вусы, барада, адамаў яблык; у жанчын — тыповае развіццё грудных залоз, форма таза, значнае развіццё тлушчавай клятчаткі. Д.п.п. жывёл: характэрнае яркае апярэнне самцоў птушак, пахучыя залозы, добра развітыя рогі, клыкі ў самцоў млекакормячых.

ДРУ́ГАСНЫЯ Я́КАСЦІ ў філасофіі, гл. *Першасныя і другасныя якасці*.

ДРУГА́Я ІМПЕ́РЫЯ, перыяд праўлення ў Францыі імператара *Напалеона III* [2.12.1852—4.9.1870], які прыйшоў да ўлады ў выніку дзярж. перавароту, што скасаваў *Другую рэспубліку*. *Вераснёўская рэвалюцыя 1870* знішчыла Д.і. і абвясціла Францыю рэспублікай.

ДРУГА́Я КАНФЕРЭ́НЦЫЯ КАМПА́РТЫІ ЛІТВЫ́ І ЗАХО́ДНЯЙ БЕЛАРУ́СІ. Адбылася 2—4.2.1919 у Вільні. Прысутнічалі 32 дэлегаты з рашаючым і 32 з дарадчым голасам ад больш чым 5 тыс. чл. КПЛіЗБ. Парадак дня: справаздача ЦК (П.Эйдукевіч), тактыка партыі (К.Цыхоўскі), даклады з месцаў, сав. будаўніцтва, агр. пытанне (З.І.Ангарэціс), адносіны да Часовага рэв. рабоча-сял. ўрада, аб'яднанне Літ. і Бел. Сав. рэспублік. Канферэнцыя паставіла перад парт. арг-цыямі задачу мабілізаваць рабочы клас на далейшае развіццё рэвалюцыі, падкрэсліла, што «выбарчым правам могуць карыстацца толькі пралетарыі і паўпралетарыі». Парт. арг-цыям даручалася неадкладна пачаць узбройваць і абучаць ваен. справе ўсіх членаў партыі. Канферэнцыя выказалася супраць падзелу памежнічыцкай зямлі паміж сялянамі, пастанавіла ў мэтах спынення спекуляцыі ўвесці манаполію на гандаль. Ухваліла дзейнасць Часовага рэв. рабоча-сял. ўрада на чале з В.С.Міцкевічам-Капсукасам і прыняла рашэнне пра аб'яднанне Літ. і Бел. Сав. рэспублік. У прынятай рэзалюцыі аб камсамоле гал. яго задачай вызначыла «падрыхтоўку свядомых барацьбітоў за камунізм». Адначасова ў Мінску праходзіў *Першы Усебеларускі з'езд Саветаў*, які прыняў пастанову пра аб'яднанне Беларусі і Літвы.

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях. Ч. 1 (1903—1921 гг.). Мн., 1934; Борьба за Советскую власть в Литве в 1918—1920 гг.: Сб. док. Вильнюс, 1967. *У.М.Міхнюк.*

ДРУГА́Я КАНФЕРЭ́НЦЫЯ КПЗБ. Адбылася нелегальна 30.11.1924 у Вільні. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічала 17 дэлегатаў, з іх 14 з рашаючым голасам ад Баранавіцка-Слонімскай, Беластоцкай, Брэсцкай, Віленскай, Гродзенскай і Пінскай акруг, ЦК КПЗБ, ЦК КСМЗБ. Парадак дня: справаздача ЦК КПЗБ; даклад аб V кангрэсе Камінтэрна; пытанні тактыкі; арганізац. і бягучыя пытанні; выбары ЦК КПЗБ, дэлегатаў на III з'езд Кампартыі Польшчы. Канферэнцыя адзначала, што за перыяд ад *Першай канферэнцыі КПЗБ* (1923) партыя выросла колькасна, умацавалася арганізацыйна, стала сур'ёзнай палітычнай сілай у Зах. Беларусі і Польшчы. Паставіла перад партыяй нерэальную задачу «пачаць арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку ўзброенага паўстання». Адхіліла лозунг аўтаноміі для Зах. Беларусі ў межах Польшчы, выстаўлены ППС і інш. партыямі, і проціпаставіла яму лозунг уз'яднання Зах. Беларусі з БССР. Асудзіла *сэцэсію* як антыпарт. групоўку. У склад ЦК КПЗБ абраны Л.Н.Аранштам, А.П.Данялюк, А.Р.Капуцкі, І.К.Лагіновіч (П.Корчык), С.А.Мертэнс, С.Т.Мілер, Л.І.Родзевіч, В.З.Харужая і інш., дэлегатамі на III з'езд КПРП — Аранштам, Данялюк, Лагіновіч, Мертэнс, Харужая.

Літ.: Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.). Мн., 1966. *І.Ф.Дзяшко.*

«ДРУГА́Я ПРАМО́ВА РУСІ́НА АБ НАРАДЖЭ́ННІ ХРЫСТА́» [«Ulia Concio Ruthena pro Nativitate Oni (Domini)»], ананімны сатыр. твор бел. л-ры 1-й пал. 18 ст. Уваходзіць у рукапісны зб. твораў на бел., лац. і польск. мовах (нап. 1711—41, часткова апубл. 1965). Напісана на бел. мове лацінкай, цытаты з рэліг. л-ры на лац. мове, трапляецца польская і рус. лексіка. Пабудавана па канонах царк. *казання*, у аснове якога традыц. рэліг. сюжэт (пастыры—авечкі—ваўкі), напоўнены актуальным зместам. У творы выявіліся асветніцкія ідэі і парадаксальнасць, барочная квяцістасць стылю. Належыць, відаць, таму ж аўтару, што і «*Прамова Русіна*».

Публ.: Прамова Русіна аб нараджэнні Хрыста // Полымя. 1965. № 9.

Літ.: Міско С. Невядомыя беларускія творы першай паловы XVIII ст. // Полымя. 1965. № 9; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Мн., 1968. Т. 1. С. 412—414; Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 295—297.

ДРУГА́Я РЭСПУ́БЛІКА, французская бурж. рэспубліка, устаноўленая 25.2.1848 (гл. *Рэвалюцыя 1848 у Францыі*) пасля падзення *Ліпеньскай манархіі*. Існавала да дзярж. перавароту Луі Банапарта (гл. *Напалеон III*) 2.12.1851, фармальна да 2.12.1852, калі была абвешчана *Другая імперыя*.

ДРУГА́Я СІГНА́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА, якасна адметная, уласцівая толькі чалавеку форма *вышэйшай нервовай дзейнасці* — сістэма моўных сігналаў. Паняцце ўвёў І.П.*Паўлаў* (1932). З'яўляецца ў працэсе эвалюцыі ў цеснай сувязі з сац.-прац. фактарам як істотны дадатак да першай сігнальнай сістэмы, якая базіруецца на непасрэдным успрыняцці навакольнага асяроддзя (раздражняльнікаў) праз органы пачуццяў. Словы, што вымаўляюцца, чуюцца і бачацца, з'яўляюцца адцягненым, апасродкаваным вобразам канкрэтных прадметаў і з'яў рэальнага свету, сігналы першасных сігналаў. Яны надзяляюць чалавека здольнасцю да абстрагавання, абагульнення, мышлення, да навук. творчасці. Д.с.с. развіваецца ў ходзе антагенезу, паступова займае дамінуючае становішча. Нейрафізіял. структура мовы ўключае стадыю аферэнтнага сінтэзу, на аснове якой складаецца рашэнне выказаць якую-н. думку. Разам з гэтым фарміруецца і акцэптар выніку дзеяння — апарат, які праграміруе мэту і кантралюе яе рэалізацыю шляхам пастаяннай карэкцыі слоў, што выключае магчымыя памылкі ў выказванні думкі.

У.М.Калюноў.

ДРУГА́Я СУСВЕ́ТНАЯ ВАЙНА́ 1939—45, самая вялікая і кровапралітная вайна ў гісторыі чалавецтва. У яе была ўцягнута 61 дзяржава, больш за 80% насельніцтва Зямлі, ваен. дзеянні ішлі на тэр. 40 дзяржаў, а таксама на марскіх і акіянскіх прасторах. Пачалася ў выніку абвастрэння барацьбы паміж буйнейшымі дзяржавамі за перадзел зон уплыву, што склаліся пасля *першай сусветнай вайны 1914—18*. Вырашальную ролю ў развязванні вайны адыграла Германія, правячыя колы якой імкнуліся ліквідаваць *Версальска-Вашынгтонскую сістэму* дагавораў (1919—22). З устанаўленнем у 1933 фаш. дыктатуры палітыка Германіі грунтавалася на ідэалогіі нацызму. У 1936 Германія заключыла дагавор з Японіяй, вядомы пад назвай «*Антыкамінтэрнаўскі пакт*», да якога потым далучыліся Італія, Іспанія і інш. краіны; у 1939—40 ён ператварыўся ў адкрыты ваен. саюз Германіі, Італіі і Японіі (гл. *Берлінскі пакт 1940*). Блоку агрэсіўных краін процістаяла кааліцыя Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША і іх саюзнікаў. Правячыя колы зах. дзяржаў, спрабуючы адвесці пагрозу ад сваіх краін, спачатку імкнуліся не да таго, каб стрымаць фаш. агрэсараў, а каб накіраваць іх удар на інш. дзяржавы, потым на СССР. Такая палітыка паскарала рост ваенна-прамысл. патэнцыялу дзяржаў фаш. блоку. Японія ў пач. 1930-х г. акупіравала значную ч. Кітая, Італія ў 1935 — Эфіопію, у 1939 — Албанію, Германія ў 1938 — Аўстрыю (гл. *Аншлюс*). У 1936—39 здзейснена герм.-італьянская інтэрвенцыя ў Іспаніі. Кульмінацыяй патуральніцкай палітыкі зах. дзяржаў у адносінах да фаш. агрэсараў стала *Мюнхенскае пагадненне 1938* аб расчляненні Чэхаславакіі: 1.10.1938

Германія акупіравала Судэцкую вобл., у 1939 — усю краіну.

Каб прадухіліць агрэсію на У, СССР заключыў з Германіяй 23.8.1939 дагавор аб ненападзе, а 28.9.1939 — дагавор «Аб дружбе і граніцы». Сав. Саюз імкнуўся выйграць час для ўмацавання сваёй абараназдольнасці.

Да 1.9.1939 нацысцкая Германія мела ўзбр. сілы ў 4,6 млн. чал., 4093 баявыя самалёты, 3195 танкаў, 107 караблёў, у т.л. 57 падводных лодак. Аснову стратэгічнай канцэпцыі вермахта складаў «бліцкрыг» (*«маланкавая вайна»*). Вайна пачалася нападам 1.9.1939 гітлераўскай Германіі на Польшчу. 3.9.1939 вайну Германіі аб'явілі Вялікабрытанія і Францыя. У склад іх кааліцыі ўвайшлі і брыт. дамініёны і калоніі (Аўстралія, Новая Зеландыя, Індыя, Паўд.-Афр. Саюз, Канада і інш.). На працягу 9 месяцаў усе гэтыя краіны вялі т.зв. *«дзіўную вайну»* — практычна нічога не рабілі. Гэта дазволіла Германіі за некалькі тыдняў разграміць Польшчу, паступова акупіраваць Данію, Нарвегію, Бельгію, Галандыю, Люксембург. 17.9.1939 СССР увёў свае войскі на тэр. Зах. Беларусі і Зах. Украіны, якія былі ў складзе Польшчы. Зах. Беларусь аб'ядналася з БССР, Зах. Украіна — з УССР. 10.5.1940 ням.-фаш. войскі пачалі наступленне на Францыю. Абышоўшы «лінію Мажыно» з Пн, прарваўшы абарону ў раёне Седана, 20 мая гітлераўцы выйшлі да Ла-Манша. Бельгійская армія, брыт. экспедыц. сілы і частка франц. арміі былі адрэзаны ў Фландрыі. 28 мая капітулявала бельгійская армія. Англійскім і частцы франц. і бельг. войск, блакіраваным у раёне Дзюнкерка, удалося эвакуіравацца ў Вялікабрытанію (гл. *Дзюнкеркская аперацыя 1940*). У пач. чэрв. 1940, прарваўшы фронт, гітлераўцы вымусілі франц. армію капітуляваць (гл. *Французская кампанія 1940*). 14 чэрв. без бою заняты Парыж. 22 чэрв. Францыя падпісала акт аб капітуляцыі. 10.6.1940 Італія аб'явіла вайну Францыі і Вялікабрытаніі. Італьян. войскі ў жн. захапілі Брыт. Самалі, частку тэр. Кеніі і Судана, у сярэдзіне вер. ўварваліся ў Егіпет, але ў снеж. 1940 разбіты англ. войскамі. Пачатае ў кастр. 1940 наступленне італьянцаў з Албаніі на Грэцыю грэч. армія адбіла. У студз.—маі 1941 брыт. войскі пры падтрымцы паўстаўшага насельніцтва і партызан выгналі італьянцаў з Брыт. Самалі, Кеніі, Судана, Эфіопіі, Італьян. Самалі, Эрытрэі. Італьян. флот на Міжземным моры панёс вялікія страты. У пач. 1941 у Паўн. Афрыку на дапамогу італьян. войскам прыбыў герм. Афрыканскі корпус ген. Э.Ромеля. У крас. 1941 італьян.-ням. войскі дасягнулі лівійска-егіпецкай граніцы. У той жа час яп. войскі пачалі акупацыю новых раёнаў Кітая, захапілі паўн. ч. франц. Інданітая. Пасля паражэння Францыі Вялікабрытанія апынулася адзін на адзін з Германіяй. Дапамагчы англічанам усё больш схіляўся ўрад ЗША. Вясной 1941 ЗША увялі свае войскі ў Грэнландыю, летам — у Ісландыю. У жн. 1940 герм. авіяцыя пачала масіраваную бамбардзіроўку Вялікабрытаніі (гл. *Бітва за Англію 1940—41*).

Летам 1940 да СССР былі далучаны Прыбалт. дзяржавы, на іх тэр. створана магутная групоўка Чырв. Арміі, якая магла наносіць прамыя ўдары па Германіі з мора і паветра. 28.6.1940 Чырв. Армія ўвайшла ў Бесарабію і Паўн. Букавіну, з тэр. якіх сав. авіяцыя магла пагражаць нафтапромыслам Румыніі — гал. пастаўшчыка нафты Германіі. У адказ у вер. 1940 Германія ўвяла свае войскі ў Румынію. Паміж Германіяй і СССР пачаўся перыяд адкрытага дыпламат. проціборства за ўплыў на Балканах. Ужо ў крас. 1941 Германія цалкам панавала ў гэтым рэгіёне, вясной 1941 яна акупіравала Балгарыю, Грэцыю, частку Югаславіі. Да Берлінскага пакта далучыліся Венгрыя, Румынія, Славакія, у 1941 — Балгарыя і Фінляндыя. Сав. Саюзу ўдалося дасягнуць буйной паліт. перамогі на Усходзе: 13.4.1941 падпісаны сав.-яп. пакт аб нейтралітэце, што значна знізіла верагоднасць вайны на 2 фронты.

22.6.1941 нацысцкая Германія напала на СССР. Пачалася *Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941—45*, якая стала найважнейшай часткай Д.с.в. Настаў якасна новы этап вайны, які прывёў да кансалідацыі ўсіх антыгітлераўскіх сіл. 12.7.1941 заключана пагадненне паміж СССР і Вялікабрытаніяй аб сумесных дзеяннях, 2 жн. — паміж СССР і ЗША аб ваенна-эканам. супрацоўніцтве і аказанні матэрыяльнай падтрымкі СССР. 14.8.1941 ЗША і Вялікабрытанія абнародавалі *Атлантычную хартыю*, да якой 24 вер. далучыўся СССР. Каб папярэдзіць стварэнне фаш. ваен. баз на Б.Усходзе, англ. і сав. войскі ў жн.—вер. 1941 увайшлі ў Іран. Сумесныя ваенна-паліт. дзеянні сталі пачаткам стварэння *антыгітлераўскай кааліцыі*. Супраць СССР Германія кінула свае асн. сілы: 83% сухапутных сіл вермахта, у т.л. 86% танк. дывізій і 100% матарызаваных, 4 з 5 паветраных флатоў. Сав.-герм. фронт стаў асноўным.

Гітлераўскія войскі за 3 тыдні прасунуліся на 350—600 км, захапілі Прыбалтыку, Малдавію, Беларусь, значную частку Украіны і РСФСР. Аднак Германіі не ўдалося дасягнуць стратэгічнай мэты *«Барбароса плана»*. У выніку контрнаступлення Чырв. Арміі ў час *Маскоўскай бітвы 1941—42* пацярпеў крах міф пра непераможны вермахт, значна актывізаваўся партызанскі рух на акупіраванай тэр. СССР і *Рух Супраціўлення*; Германія вымушана была перайсці да тактыкі працяглай вайны.

Да арт. **Другая сусветная вайна 1939—45**. Салдаты вермахта ўзломліваюць польскую дзяржаўную граніцу (1.9.1939).

7.12.1941 Японія нападам на амер. ваен. базу Пёрл-Харбар у Ціхім акіяне развязала вайну супраць ЗША. 8 снеж. ЗША, Вялікабрытанія і шэраг іншых краін аб'явілі вайну Японіі. 1.1.1942 падпісана Дэкларацыя прадстаўнікамі 26 дзяржаў — удзельніц антыгітлераўскай кааліцыі, якая абавязвала іх выкарыстоўваць ваен. і эканам. рэсурсы ў вайне супраць краін фаш. блока. 26.5.1942 СССР і Вялікабрытанія падпісалі дагавор аб саюзе супраць Германіі і яе сатэлітаў. 11.6.1942 СССР і ЗША

Да арт. **Другая сусветная вайна 1939—45**. Салдаты Войска Польскага праходзяць па вызваленай Варшаве (1945).

заключылі пагадненне аб прынцыпах узаемадапамогі ў вядзенні вайны.

Летам 1942 ням. войскі пачалі новае наступленне на сав.-герм. фронце. 17.7.1942 пачалася *Сталінградская бітва 1942—43* — адна з пераломных у вайне. 19.11.1942 пачалося контрнаступленне сав. войск пад Сталінградам, якое скончылася акружэннем і разгромам 330-тыс. групоўкі войск праціўніка. Захапіўшы ініцыятыву, Чырв. Армія нанесла гітлераўцам шэраг паражэнняў зімой і вясной 1943. Англ. войскі ў гэты час бамбілі гарады Германіі, вялі баі ў Паўн. Афрыцы. Японія панавала на моры, акупіравала Бірму, Малаю, Філіпіны, а-вы Інданезіі і інш., стварыла пагрозу Аўстраліі. Нарошчванне сіл ЗША у Ціхім акіяне з 1-й пал. 1942 прывяло да змены суадносін сіл на карысць саюзнікаў. Пасля шэрагу паражэнняў у Каралавым моры і каля в-ва Мідуэй (1942) яп. флот перайшоў да абароны. Пасля падзей у Эль-Аламейнскай аперацыі ЗША і Вялікабрытанія ў сярэдзіне ліст. 1942 занялі тэр. Марока, Алжыра, уступілі ў Туніс; вясной 1943 дамагліся капітуляцыі італа-герм. войск на п-ве Бон. 10.7.1943 амер. і англ. войскі высадзіліся на в-ве Сіцылія, у пач. верасня — на Апенінскім п-ве. 25 ліп. фаш. ўрад Мусаліні быў скінуты. Новы італьян. ўрад 3.9.1943 падпісаў перамір'е з ЗША і Вялікабрытаніяй, у кастр. аб'явіў вайну Германіі. Пачаўся распад фаш. блока. На працягу 1943 амер. войскі высадзіліся ў Новай Гвінеі, захапілі Алеуцкія а-вы, нанеслі шэраг паражэнняў яп. ВМФ.

Разгром ням.-фаш. войск у *Курскай бітве 1943* прымусіў фаш. Германію перайсці да стратэгічнай абароны, на ўсіх франтах змянілася ваенна-паліт. становішча. Колькасць дзяржаў, што аб'явілі вайну Германіі, з чэрв. 1941 да снеж. 1943 павялічылася з 5 да 36. У 1944 сав. войскі ліквідавалі блакаду Ленінграда, вызвалілі Правабярэжную Украіну, Крымскі п-аў, увайшлі ў Румынію. У выніку *Беларускай аперацыі 1944* была вызвалена ўся тэр. Беларусі, значная частка Літвы, Латвіі, пачалося вызваленне Польшчы. 23.8.1944 у выніку паўстання ў Румыніі быў скінуты ваенна-фаш. рэжым Антанеску; новы ўрад аб'явіў вайну Германіі. Тое ж адбылося і ў Балгарыі. 29.8.1944 пачалося Славацкае нац. паўстанне. Сав. войскі вялі баі за вызваленне Чэхаславакіі, Венгрыі, Югаславіі, паўн.-ўсх. раёнаў Нарвегіі (гл. *Будапешцкая аперацыя 1944—45, Вісла-Одэрская аперацыя 1945*). 6.6.1944 англа-амер. і канадскія войскі высадзіліся ў Нармандыі, 15 жн. амер.-французскія — у Паўд. Францыі, быў адкрыты *другі фронт*. 19.8.1944 пачалося Парыжскае паўстанне, да прыходу саюзнікаў франц. сталіца была ўжо ў руках патрыётаў. У пач. 1945 пачалося магутнае наступленне сав. войск па ўсім фронце ад Карпат да Балтыйскага мора, а армій саюзнікаў — у Італіі і Германіі. Для каардынацыі дзеянняў саюзнікаў і паслявае. ўпарадкавання свету адбылася *Крымская канферэнцыя 1945*. У 2-й пал. красавіка — пач. мая саюзнікі дайшлі да Эльбы, уступілі ў Чэхаславакію, Аўстрыю. 16 крас. пачалася *Берлінская аперацыя 1945*. 25 крас. сав. войскі ў раёне Торгаў на р. Эльба аб'ядналіся з часцямі 1-й амер. арміі. 6—11.5.1945 сав. войскі разгромілі апошнюю ням. групоўку і завяршылі вызваленне Чэхаславакіі. У поўнач 8 мая ў Карлсхорце (прадмесце Берліна) прадстаўнікі герм. вярх. галоўнакамандавання падпісалі акт аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. У маі 1945 з усёй каліцыі дзяржаў, якія развязалі Д.с.в., барацьбу працягвала толькі Японія. Разам з еўрап. праблемамі на *Патсдамскай канферэнцыі 1945* была ўдзелена вял. ўвага лёсу Японіі. 8.8.1945 СССР аб'явіў вайну Японіі, 10 жн. тое ж зрабіла Манголія. Сав.-мангольскія войскі разгромілі квантунскую армію і вызвалілі паўн.-ўсх. частку Кітая, Паўн. Карэю, 6 і 9 жн. ЗША упершыню выкарысталі новую зброю, скінуўшы 2 атамныя бомбы на гарады Хірасіма і Нагасакі. 2.9.1945 Японія падпісала акт аб капітуляцыі. Д.с.в. скончылася.

Да арт. **Другая сусветная вайна 1939—45**. Жыхары Сафіі вітаюць часці Чырвонай Арміі (верасень 1944).

Подзвігам людзей, сярод якіх было шмат беларусаў, у Д.с.в. быў іх удзел у падп. барацьбе супраць фашызму ў канцлагерах Асвенцім, Бухенвальд, Дахау, Майданак і інш. У Маўтгаўзене пасля гераічнай гібелі ген.-лейт. Дз.М.Карбышава падп. барацьбу ўзначаліў ураджэнец Чавусаў палк. Л.Я.Маневіч. У канцлагерах у Рэгенсбургу, Нойаўбінгу, Вурдэне, Асвенціме і інш. актыўную барацьбу вялі ген. П.Д.Цумараў і інш. патрыёты. Найбольш моцным і арганізаваным быў удзел сав. патрыётаў, у т.л. беларусаў, у франц. Супраціўленні. Д.с.в. была самай разбуральнай і крывапралітнай у свеце. У ёй загінула каля 62 млн. чал. Найбольшую колькасць ахвяр панёс Сав. Саюз — 27 млн. чал., у т.л. больш за 2,5 млн. — жыхары Беларусі. За вял. ўклад у перамогу над фаш. Германіяй БССР была запрошана на канферэнцыю ў Сан-Францыска (25.4.1945) для выпрацоўкі і падпісання (26.6.1945) Статута ААН і

Да арт. **Другая сусветная вайна 1939—45**. Падпісанне акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі (8.5.1945).

ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ЕЎРАПЕЙСКІ ТЭАТР ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ


Паўночны палярны круг
Нарвежскае мора
Атлантычны акіян
Паўночнае мора
Балтыйскае мора
Ірландскае мора
Англійскі праліў
Біскайскі заліў
Міжземнае мора
Чорнае мора
Каспійскае мора
Ледавіты акіян
Белае мора
Ісландыя
Ірландыя
Нарвегія
Швецыя
Фінляндыя
Данія
Германія
Польшча
Чэхаславакія
Аўстрыя
Венгрыя
Румынія
Балгарыя
Югаславія
Грэцыя
Албанія
Турцыя
Іспанія
Партугалія
Францыя
Італія
Англія
Ірландыя
Бельгія
Нідэрланды
Люксембург
Швейцарыя
Вольны горад Данцыг (Гданьск)
Ліван (Фр. мандат)
Палесціна (Брыт. мандат)
Трансіярданія (Брыт. мандат)
Саудаўская Аравія
Марока (Ісп.)
Алжыр (Фр.)
Лівія (It.)
Егіпет
Іран
Ірак
Сірыя
Ліван
Трансіярданія
Саудаўская Аравія
Турцыя
Мурманск
Архангельск
Петразаводск
Ленінград
Масква
Горкі
Куйбышаў
Сталінград
Арэнбург
Свярдлоўск
Кіраў
Таўда
Урал
Волга
Дон
Днепрапятроўск
Кіеў
Адэса
Севастопаль
Новарасійск
Грозны
Тбілісі
Баку
Ерэван
Курск
Варонеж
Мінск
Брэст
Рыга
Каўнас
Кенігсберг
Варшава
Берлін
Прага
Вена
Будапешт
Бухарэст
Белград
Сафія
Афіны
Салонікі
Тырана
Рым
Неапаль
Сан-Марына
Мілана
Манака
Марсель
Тулон
Барселона
Мадрыд
Лісабон
Бардо
Нант
Страсбург
Дюнкерк
Брусель
Амстэрдам
Лондан
Ліверпуль
Глазга
Дублін
Осла
Бергэн
Тронхейм
Нарвік
Стакгольм
Хельсінкі
Таліна
Рыга
Каўнас
Мінск
Брэст
Кіеў
Адэса
Севастопаль
Новарасійск
Грозны
Тбілісі
Баку
Ерэван
Курск
Варонеж

ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНЯЙ АЗІІ І НА ЦІХІМ АКІЯНЕ Ў 1941–1945гг.

Маштаб 1:80 000 000

тым самым быць у ліку першапачатковых дзяржаў — заснавальніц ААН.

Разгром фашызму карэнным чынам змяніў расстаноўку сіл у свеце. Перамога, атрыманая пры вырашальнай ролі СССР, прывяла да стварэння сусв. сістэмы сацыялізму, якая паўстагоддзя рабіла глабальны ўплыў на развіццё пасляваен. свету. Эканам. і ваенна-паліт. цэнтр краін Захаду перамясціўся з Еўропы ў ЗША. Перамога над фашызмам выклікала рост нац. самасвядомасці народаў, спрыяла распаду каланіяльнай сістэмы.

Літ.: История второй мировой войны, 1939—1945. Т. 1—12. М., 1973—82; Документы и материалы кануна второй мировой войны, 1937—1939. Т. 1—2. М., 1981; Год кризиса, 1938—1939: Док. и материалы. Т. 1—2. М., 1990; Черчилль У. Вторая мировая война: Сокр. пер. с англ. Кн. 1—3. М., 1991; От Мюнхена до Токийского залива: Взгляд с Запада на трагич. страницы истории второй мировой войны: Перевод. М., 1992; Вторая мировая война: Два взгляда. М., 1995.

У.І.Гуленка.

ДРУГА́Я УСЕБЕЛАРУ́СКАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ. Адбылася 12—16.10.1925 у Берліне як нарада бел. паліт. дзеячаў у эміграцыі. Склікана А.Цвікевічам. З'явілася вынікам расколу ў бел. эміграцкім асяроддзі, а таксама перамен, што адбыліся ў 1921—25 у БССР і Зах. Беларусі пасля *Першай Усебеларускай канферэнцыі* (Прага, 1921). На Д.У.к. прыехалі З.Жылуновіч і нам. паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Польшчы А.Ульянаў. Перад канферэнцыяй урад *Беларускай Народнай Рэспублікі* прыняў 2 пастановы. Паводле 1-й, супраць якой галасаваў В.Захарка, Рада Міністраў БНР спыняла сваю дзейнасць і прызнавала Мінск «адзіным цэнтрам нацыянальнадзяржаўнага адраджэння Беларусі». Паводле 2-й, прынятай аднагалосна, Урад БНР абвяшчаўся зліквідаваным. Пасля гэтага Д.У.к. большасцю галасоў прызнала Мінск цэнтрам бел. адраджэння. Пастановы Рады Міністраў не мелі сілы, бо яна не магла засядаць асобна ад Прэзідыума *Рады БНР*. Старшыня Рады БНР П.Крачэўскі і яго нам. Захарка не прызналі рашэнні Д.У.к., а член Прэзідыума Рады БНР Я.Мамонька склаў пратэст на імя старшыні канферэнцыі К.Езавітава. Дзярж. пячатка засталася ў Крачэўскага. Потым яна перадавалася наступным старшыням Рады БНР. У л-ры за 1-й і 2-й канферэнцыямі замацаваліся назвы Усебел. паліт. канферэнцый або Нац.-паліт. нарад.

Літ.: Цьвікевіч А. Берлінская канферэнцыя // Полымя. 1926. № 4; За дзяржаўную незалежнасць Беларусі: Дак. і матэрыялы... Лёндан, 1960; Крэчэўскі П. Мандаты БНР // Спадчына. 1993. № 1; Сідарэвіч А. Берлінская канферэнцыя 1925 г.: паліт. варункі, рашэнні, вынікі // Культура. 1993. 3 жн.

А.М.Сідарэвіч.

ДРУГА́Я УСЕБЕЛАРУ́СКАЯ КРАЯЗНА́ЎЧАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ. Адбылася 7—12.1.1929 у Мінску. Прысутнічалі 72 дэлегаты ад 300 краязн. арг-цый (аб'ядноўвалі больш за 10 тыс. чл.), прадстаўнікі краязн. т-ваў РСФСР і УССР. З дакладамі выступілі У.Ігнатоўскі, В.Ластоўскі, Я.Лёсік, А.Ляўданскі, М.Каспяровіч, І.Сербаў і інш. Вырашыла арганізац. пытанні: кіраўніцтва краязнаўствам Акадэміяй навук, падрыхтоўка краязнаўцаў сярэднімі і вышэйшымі навуч. ўстановамі, справаздача Цэнтр. бюро краязнаўства (ЦБК) і акр. т-ваў, змены ў статуце і выбары ЦБК, зацвярджэнне новых чл.-кар. ЦБК. У справаздачы адзначана пашырэнне краязнаўчага руху ў Беларусі — адкрыты 22 краязн. музеі, выдадзены чарговыя зб-кі краязн. прац «Аршаншчына», «Віцебшчына», апісанні Асіповіцкага і Горацкага р-наў, у друку знаходзіліся слоўнікі Віцебшчыны, Мазыршчыны, Чэрвеньшчыны, падрыхтаваны да выдання апісанні шэрагу нас. пунктаў. Праца канферэнцыі праходзіла ва ўмовах узмацнення таталітарнага рэжыму: абмежаваныя тэмы краязн. даследаванняў, узмоцненае вывучэнне рэв. руху, новых рыс у побыце працоўных мас.

В.С.Вяргей.

ДРУГА́Я УСТА́ЎНАЯ ГРА́МАТА да народаў Беларусі, юрыдычны і паліт. акт, выдадзены 9.3.1918 *Выканаўчым камітэтам рады Усебеларускага з'езда* ў Мінску. Беларусь абвяшчалася *Беларускай Народнай Рэспублікай* (БНР). Канстытуцыйны лад БНР закладваўся як дэмакр., парламенцкай і прававой дзяржавы. Да склікання Устаноўчага Сойма заканадаўчая ўлада ў БНР перадавалася радзе Усебел. з'езда, выканаўчая — *Народнаму сакратарыяту Беларусі*. Грамадзянам БНР гарантавалася свабода слова, друку, сходаў, забастовак, паліт., прафесійных і культ. арг-цый, свабода сумлення, недатыкальнасць асобы і жылля. Народам БНР прадастаўлялася права на нац.-персанальную аўтаномію, іх мовы абвяшчаліся раўнапраўнымі. Касавалася прыватная ўласнасць на зямлю, якая без выкупу перадавалася тым, хто на ёй працуе; лясы, азёры і нетры абвяшчаліся ўласнасцю дзяржавы.

Аднак у дакуменце не вызначаліся дакладныя тэр. дзяржавы і характар адносін БНР з інш. дзяржавамі. У выніку ўнутр. барацьбы ў кіраўніцтве БНР, *Беларускай сацыялістычнай грамадзе* і пад уздзеяннем знешніх абставін Рада БНР вымушана была прыняць *Трэцюю Устаўную грамату*.

А.М.Сідарэвіч.

ДРУГІ АФІ́НСКІ МАРСКІ́ САЮ́З, саюз стараж.-грэч. гарадоў, размешчаных пераважна на астравах і берагах Эгейскага м., на чале з *Афінамі*. Пасля распаду ў выніку *Пелапанескай вайны* 1-га Афінскага марскога саюза (гл. *Дэлоскі саюз*) прыкладна з 395 да н.э. рабіліся спробы па яго ажыўленні. Адноўлены ў 378—377 да н.э. пасля вызвалення ад спартанскага панавання. Чл. саюза (каля 75) мелі поўную аўтаномію. Гарады, размешчаныя ў М.Азіі, не ўключаліся ў склад саюза. Са стратай Спартай панаючага становішча ў *Пелапанескім саюзе*, супраць якога ў першую чаргу і была накіравана дзейнасць Д.а.м.с., з яго сталі выходзіць многія члены. Пасля завяршэння міжсаюзнай вайны 357—355 да н.э. саюз да 337 да н.э. захоўваў нязначны паліт. ўплыў.

З.І.Малейка.

ДРУГІ́ ЗАКО́Н ТЭРМАДЫНА́МІКІ, закон павелічэння *энтрапіі*, адзін з асн. законаў *тэрмадынамікі*. Паводле Д.з.т. ў замкнёнай (ізаляванай у цеплавым і мех. сэнсе) сістэме энтрапія S сістэмы застаецца нязменнай (пры абарачальных, раўнаважных працэсах) або павялічваецца (пры неабарачальных працэсах) і ў стане раўнавагі дасягае максімуму ($\Delta S \geq 0$).

Гістарычна Д.з.т. ўзнік з аналізу работы цеплавых машын у працах С.Карно (1824). Першую фармулёўку закона даў Р.*Клаўзіус* (1850): немагчымы пераход цеплыні ад цела больш халоднага да цела больш нагрэтага без якіх-н. інш. змен у тэрмадынамічнай сістэме ці навакольным асяроддзі (іншыя фармулёўкі эквівалентныя). Д.з.т. ў тэрмадынамічным сэнсе азначае, што ўсе рэальныя макраскапічныя працэсы неабарачальныя, а ў імавернасна-статыстычным сэнсе, — што найб. імавернымі станам сістэмы з'яўляецца яе раўнаважны стан. Гл. таксама *Больцмана прынцып, Неабарачальныя працэсы*.

ДРУГІ́ З'ЕЗД КП(б)Б (аб'яднаўчы). Адбыўся 4—6.3.1919 у Вільні. Прысутнічалі 159 дэлегатаў з рашаючым і 10 з дарадчым голасам ад 17 636 камуністаў Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, ч. Ковенскай і Сувалкаўскай губ. Парадак дня: даклады ЦБ КП(б)Б і ЦК КП(б)ЛіЗБ (В.Г.Кнорын, А.І.Вайнштэйн-Браноўскі); аб'яднанне Кампартыі Беларусі і Кампартыі Літвы і Зах. Беларусі; III Камуніст. Інтэрнацыянал (В.С.Міцкевіч-Капсукас); арганізац. пытанне; Саветы і партыя (І.І.Рэйнгольд); работа на вёсцы; ваен. пытанне; праграма Камуніст. партыі (А.Ф.Мяснікоў); выбары кіруючых органаў. Скліканне з'езда было абумоўлена ўтварэннем *Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* (Літбел). З'езд ухваліў утварэнне Літбела і пастанавіў аб'яднаць Кампартыю Беларусі і Кампартыю Літвы і Зах. Беларусі ў адзіную *Камуністычную партыю (бальшавікоў) Літвы і Беларусі* [КП(б)ЛіБ] «як неад'емную частку РКП(б)». Зацвердзіў «Палажэнне па арганізацыйным пытанні», у якім вызначалася структура пабудовы КП(б)ЛіБ. У тэзісах «Саветы і партыя» замацоўваліся прынцыпы, формы і метады парт. кіраўніцтва Саветамі. З'езд прыняў тэзісы па ваен. пытанні, у якіх падкрэслівалася неабходнасць строгага класавага прынцыпу фарміравання Чырв. Арміі. Была прынята рэзалюцыя аб Камуніст. саюзе моладзі. Выбраў ЦК КП(б)ЛіБ у складзе 15 чл., дэлегатаў на VIII з'езд РКП(б) — 18 чал.

Літ.: Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. (1918—1927). Мн., 1983.

У.М.Міхнюк.

ДРУГІ́ З'ЕЗД КПЗБ. Адбыўся 8—18.5.1935 у в. Сляпянка каля Мінска (цяпер у межах горада). У рабоце з'езда

ўдзельнічалі 57 чал., у т.л. 21 дэлегат з рашаючым і 13 з дарадчым голасам ад 3327 членаў партыі Беластоцкай, Віленскай, Глыбоцкай, Гродзенскай, Навагрудскай і Слонімскай акруг КПЗБ. Парадак дня: паліт. сітуацыя ў Польшчы, адзіны рабочы і антыфаш. нар. фронт (Ю.Ленскі); паліт. справаздача ЦК КПЗБ і задачы партыі [І.К.Лагіновіч (П.Корчык)]; задачы партыі ў нац.-вызв. руху (М.С.Арэхва); справаздачы мандатнай, арганізац., прафс., вясковай і маладзёжнай камісій; выбары ЦК. Была разгледжана таксама дзейнасць КСМЗБ. З'езд ухваліў паліт. лінію і практычную дзейнасць ЦК, вызначыў задачы партыі па развіцці рэв. і нац.-вызв. руху ва ўмовах наступу сіл фашызму і нарастання ваен. небяспекі. Гал. недахопам партыі ў практычнай дзейнасці, на думку дэлегатаў, былі сектанцкія погляды і метады работы. У сял. пытанні была дадзена ўстаноўка на арганізацыю барацьбы сял. мас за частковыя патрабаванні: змяншэнне падаткаў, шарварак, арэнднай платы, адмена камасацыі і інш. Асн. задачай партыі ў нац.-вызв. руху з'езд вызначыў стварэнне антыакупац. нар. фронту. Прыняў рэзалюцыю «На барацьбу з пагрозай вайны, у абарону СССР». З'езд выбраў ЦК КПЗБ: чл. Лагіновіч, С.А.Мертэнс, М.А.Блінчыкаў, Арэхва, Е.І.Шоламаў, М.П.Маслоўскі (усе 6 былі абраны таксама на VII кангрэс Камінтэрна), Ю.Брун, Л.М.Янкоўская, І.Ф.Сяменнікаў, Х.Р.Гелер, А.Раф; канд. ў чл. С.М.Малько, М.М.Дворнікаў, Ф.Б.Пірышка, Э.К.Аболіна, М.С.Майскі.

Літ.: В борьбе за демократические права и свободы. Мн., 1988. *У.Ф.Ладысеў.*

ДРУГІ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л, гл. *Інтэрнацыянал 2-і.*

ДРУГІ ПАДЗЕ́Л РЭ́ЧЫ ПАСПАЛІ́ТАЙ. Ажыццёўлены ў 1793 Рас. імперыяй і Прусіяй у змове з кансерватыўнай арыстакратыяй Рэчы Паспалітай, якая была незадаволена рэформамі *Чатырохгадовага сейма 1788—92* і *Канстытуцыяй 3 мая 1791.* Апазіцыя стварыла *Таргавіцкую канфедэрацыю* (1792) і папрасіла Кацярыну II дапамагчы аднавіць перадсеймавую сістэму кардынальных правоў. 11.5.1792 Кацярына II увяла на Беларусь і Украіну 73-тысячнае войска на чале з ген.-аншэфам М.М.Крачэтнікавым. Войску ВКЛ у баях пад Мірам 10 чэрв., Крамянцом і Брэстам 24 ліп. не ўдалося стрымаць наступ рас. арміі. 23.1.1793 Расія і Прусія заключылі ў Пецярбургу тайную канвенцыю для скасавання Канстытуцыі 3 мая і аб сумесным падаўленні ўзбр. супраціўлення з боку Рэчы Паспалітай. 27.3.1793 яны абвясцілі акты аб падзеле вызначаных долей (разам 308 тыс. км^2). Прусія анексіравала частку Мазовіі, Кракаўскае ваяв., амаль усю Вял. Польшчу, г. Гданьск, Торунь, Расія — Правабярэжную Украіну, часткі Полацкага, Мінскага ваяв., Аршанскага пав., якія засталіся пасля *першага падзелу Рэчы Паспалітай*, частку Навагрудскага, Брэсцкага і Віленскага ваяв. (да лініі Друя—Пінск з г. Барысаў, Мінск, Слуцк, Нясвіж, Тураў, Пінск; усяго 250 тыс. км^2 з 13 млн. ж.). Караля польскага і вял. князя ВКЛ Станіслава Панятоўскага прымусілі падтрымаць Генеральную канфедэрацыю і склікаць *Гродзенскі сейм 1793*, які ратыфікаваў трактаты з Расіяй і Прусіяй. *Я.К.Анішчанка.*

ДРУГІ ПАКАЗА́ЛЬНЫ ТЭА́ТР, Другі чырвонаармейскі паказальны тэатр пры палітаддзеле 16-й арміі Заходняга фронту. Існаваў з восені 1920 да ліп. 1921. Сфарміраваны ў Бабруйску з акцёраў Петраградскага нар. дома, рус. труп і ўдзельнікаў маст. самадзейнасці. Меў філіял у авіятрадзе «Ілья Мурамец». Начальнікі т-ра С.Бахрах, В.Няволін, рэж. А.Пакрасаў-Гяцэвіч. Меў важнае значэнне для аб'яднання творчых работнікаў, узаемаабагачэння бел. і рус. тэатр. культур. У рэпертуары пераважалі рус. класічная драматургія, агітацыйныя п'есы і канцэрты.

Сярод пастановак: «Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна, «Без віны вінаватыя», «Апошняя ахвяра», «Беднасць не загана», «Беспасажніца» А.Астроўскага, «Горкі лёс» А.Пісемскага, «Павел I» Дз.Мережкоўскага, «Гора ад розуму» А.Грыбаедава, «Жывы труп» Л.Талстога, «Барыс Гадуноў» А.Пушкіна, «Дні нашага жыцця» Л.Андрэева, «Рэвізор» і «Жаніцьба» М.Гогаля, «На дне» М.Горкага, «Патанулы звон» Г.Гаўптмана, «Атэла» У.Шэкспіра. У трупе т-ра было каля 80 чал., у т.л. акцёры Б.Быхоўскі, М.Дняпроў, К.Замешына, В.Зярноў, К.Кулакоў, Няволін, У.Фарасаў. Вясной 1921 т-р быў рэарганізаваны і перададзены палітупраўленню Зах. фронту, узначальваў яго Дняпроў. Неўзабаве расфарміраваны.

ДРУГІ СТА́ТУТ ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА, гл. *Статут Вялікага княства Літоўскага 1566.*

ДРУГІ УСЕБЕЛАРУ́СКІ З'ЕЗД САВЕ́ТАЎ рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Адбыўся 13—17.12.1920 у Мінску. Прысутнічалі 202 дэлегаты з рашаючым і 16 з дарадчым голасам. Парадак дня: справаздача ВРК БССР (А.Р.Чарвякоў); бягучы момант і Сав. Беларусь (В.Г.Кнорын); аб сацыяліст. землеўпарадкаванні (А.С.Хаценка); аб харч. палітыцы ў Беларусі (І.А.Адамайціс); аднаўленне прам-сці (А.І.Вайнштэйн); нар. асвета (М.Я.Фрумкіна); сац. забеспячэнне (С.З.Кацэнбоген); арганізацыя сав. улады на Беларусі (С.А.Мертэнс); аб правядзенні працоўнай павіннасці; аб рабоце каап. арг-цый; выбары ЦВК БССР і дэлегатаў на Усерас. з'езд Саветаў; бягучыя справы. З'езд адобрыў работу ВРК БССР, прыняў дадаткі да Канстытуцыі БССР, у якіх абвясціў вышэйшым органам улады рэспублікі з'езд Саветаў, а паміж з'ездамі — ЦВК БССР, выканаўчым органам — СНК БССР у складзе 15 наркаматаў. Устанавіў дзярж. манаполію на асн. віды прадукцыі, цвёрдыя цэны, дзярж. нарыхтоўку і забеспячэнне насельніцтва прадметамі першай неабходнасці; падкрэсліў неабходнасць барацьбы са спекуляцыяй і ажыццяўленне поўнай нацыяналізацыі гандлю. Вызначыў задачы СНГ БССР у аднаўленні прам-сці і транспарту. Зацвердзіў «Тэзісы па аграрным пытанні», у якіх прадугледжваў новыя, сацыяліст. формы землекарыстання, надзяленне беззямельных і малазямельных сялян землямі былых памешчыцкіх гаспадарак, стварэнне саўгасаў. Ратыфікаваў Рыжскі прэлімінарны дагавор ад 12.10.1920 і пацвердзіў мандат ВРК БССР ураду РСФСР на права заключэння ад імя БССР міру. Прыняў зварот «Да працоўнага народа Беларусі». Выбраў ЦВК БССР з 60 чл. і 12 канд., дэлегатаў на VIII Усерас. з'езд Саветаў.

ДРУГІ УСЕБЕЛАРУ́СКІ КАНГРЭ́С 1944, кангрэс *Беларускай цэнтральнай рады* (БЦР). Адбыўся 27.6.1944 у Мінску. Быў скліканы па прапанове прэзідэнта БЦР Р.Астроўскага з дазволу в.а. ген. камісара Беларусі К. фон Готберга. Прысутнічала 1039 дэлегатаў. Парадак дня: справаздача прэзідэнта БЦР праф. Астроўскага аб дзейнасці рады; выбары мандатнай камісіі і камісіі для апрацоўкі рэзалюцый; заслухванне рэферата М.Шкялёнка «Аб прызнанні за няважныя пастановы ўрада СССР і былое Польшчы, якія датычаць Беларусі, яе тэрыторыі і народу»; справаздача мандатнай камісіі (праф. Жарскі); заслухванне рэферата А.Калубовіча «Аб канчальным разрыве Беларусі з Масквою і аб Уневажанні маскоўскага голасу ў беларускіх справах»; прынятае рэзалюцый і заключная прамова. Кангрэс прызнаў правільным рашэнне *Рады Беларускай Народнай Рэспублікі* ад 25.3.1918 аб канчатковым разрыве з бальшавіцкай Масквой і Рас. дзяржавай ва ўсіх яго формах, пацвердзіў, што голас Масквы і СССР у бел. справах не мае ніякай законнай сілы, прызнаў БЦР на чале з Астроўскім «адзіным праўным прадстаўніком Беларускага народа і ягонага краю». У сувязі з набліжэннем Чырв. Арміі кангрэс праходзіў у вял. спешцы. Значэнне кангрэса было важкім у асн. для амбіцый Астроўскага, які атрымаў ад дэлегатаў паўнамоцтвы на прэзідэнцтва БЦР, чым і карыстаўся да сваёй смерці. *А.М.Літвін.*

ДРУГІ УСЕБЕЛАРУ́СКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ З'ЕЗД. Адбыўся 10—13.2.1927 у Мінску. Прысутнічала 187 дэлегатаў ад 240 краязн. арг-цый (аб'яднаўвалі больш за 9 тыс. чл.). Адбыліся 2 пленарныя пасяджэнні, працавалі секцыі: прыродна-геагр., культ.-гіст., школьна-краязн., яўрэйская. З'езд заслухаў справаздачны даклад Цэнтр. бюро краязнаўства (ЦБК, А.З.Казак), адзначыў пашырэнне краязн. руху — заснаванне шэрагу мясц. музеяў і бібліятэк, з'яўленне краязн. вопісаў некат.

раёнаў, збіранне вуснай нар. творчасці і слоўнікавага матэрыялу, практычнай і метадычнай падрыхтоўкі краязнаўцаў. Была зацверджана арганізац. структура краязнаўства рэспублікі: пярвічная адзінка — гурток; працу гурткоў аб'ядноўвалі раённыя і акр. т-вы; узначальвала, накіроўвала і каардынавала краязн. работу ЦБК пры Інбелкульце, якое распрацоўвала інструкцыі, праграмы, метадычныя дапаможнікі, апрацоўвала дасланыя краязн. матэрыялы, выдавала час. *«Наш край»*. *В.С.Вяргей.*

ДРУГІ УСЕРАСІЙСКІ З'ЕЗД САВЕТАЎ рабочых і салдацкіх дэпутатаў, адбыўся 7—9.11(25—27.10).1917 у Петраградзе. Прысутнічала 649 дэлегатаў, 390 бальшавікоў, 160 эсэраў, 72 меншавікі, 14 аб'яднаных інтэрнацыяналістаў, у т.л. ад Беларусі і салдат Зах. фронту 51 дэлегат. Парадак дня: 1) аб арганізацыі ўлады; 2) аб вайне і міры; 3) аб зямлі. У 3 гадз 10 мін 8 ліст. (26 кастр.) з'езд атрымаў вестку, што ўзяты Зімні палац і арыштаваны Часовы ўрад. Меншавікі, правыя эсэры і бундаўцы (каля 70 чал.) адмовіліся прызнаць сацыяліст. рэвалюцыю і пакінулі з'езд. З'езд прыняў напісаную У.І.Леніным адозву «Рабочым, салдатам і сялянам!», якая абвяшчала пераход улады ў рукі Саветаў. Прыняў Дэкрэты аб міры і аб зямлі, рашэнне аб пераходзе ўлады на месцах да Саветаў і інш. На з'ездзе створаны першы сав. ўрад — *Савет Народных Камісараў* на чале з Леніным.

ДРУГІ ФРОНТ, тэатр баявых дзеянняў англа-амер. войск у Зах. Еўропе супраць фаш. Германіі ў 1944—45 *другую сусветную вайну 1939—45*. Ідэя яго адкрыцця ўзнікла пасля нападзення Германіі на СССР, калі І.В.Сталін у лісце да прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі У.Чэрчыля ад 18.7.1941 прапанаваў брыт. боку пачаць ваен. дзеянні ў Паўн. Францыі і Арктыцы з мэтай адцягнуць з сав.-герм. (усх.) фронту 30—40 ням. дывізій. Чэрчыль адхіліў прапанову, спасылаючыся на недахоп сіл і сродкаў. Дасягнутыя пазней дамоўленасці з урадамі Вялікабрытаніі і ЗША аб адкрыцці Д.ф. ў Зах. Еўропе ў 1942—43 з-за розногалоссяў бакоў (напр., Чэрчыль выступаў за адкрыццё фронту на Балканах) не былі рэалізаваны. У 1942 англа-амер. войскі высадзіліся ў Паўн. Афрыцы, у 1943 на в-ве Сіцылія і ў Паўд. Італіі. На *Тэгеранскай канферэнцыі 1943* Чэрчыль і прэзідэнт ЗША Ф.Рузвельт абавязаліся адкрыць Д.ф. у маі 1944 (пазней тэрмін перанесены на чэрв. 1944). 6.6.1944 англа-амер. войскі (43 дывізіі) высадзіліся ў Паўн. Францыі (гл. *Нармандская дэсантная аперацыя 1944*). Дзейнасць Д.ф. (існаваў 11 месяцаў) паскорыла разгром фашызму. Гл. таксама *Маскоўскія нарады 1941, 1943, 1945, Квебекскія канферэнцыі, другая сусветная вайна 1939—45*.

Літ.: Ржешевский О.А. История второго фронта: война и дипломатия. М., 1988; Хастингс М. Операция «Оверлорд»: Как был открыт второй фронт. Пер. с англ. М., 1989.

ДРУГО́Е АБВЯШЧЭ́ННЕ БССР, гл. *Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь*.

ДРУГО́Е СЕ́РБСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1815, нацыянальна-вызваленчае, супраць тур. панавання ў Сербіі; гл. ў арт. *Сербскія паўстанні пачатку 19 стагоддзя*.

ДРУ́ЖБА, форма адносін паміж людзьмі, заснаваная на добраахвотнасці, узаемнай прыхільнасці, павазе і трываласці. Этыка вывучае Д. як абсалютную, самадастатковую каштоўнасць. У гісторыі філасофіі Д. разглядалася пераважна ў этычным плане, падкрэсліваўся яе эмацыянальны аспект (М.Мантэнь) або ў аснову ўзнікнення Д. ставілася агульнасць інтарэсаў і разумны эгаізм (К.Гельвецый). Сапраўдны культ Д. быў

Да арт. **Другі фронт**. Высадка англа-амерыканскіх войск у Нармандыі (Францыя, 6.6.1944).

створаны ням. рамантыкамі, якія бачылі ў ёй выратаванне ад эгаізму; сацыялісты-утапісты прапаведавалі ўстанаўленне Д. ўсіх людзей. Псіхал. змест, асн. функцыі, заканамернасці развіцця Д. залежаць ад полаўзроставых і індывід.-асобасных асаблівасцей чалавека. На кожным з жыццёвых этапаў Д. мае сваю маральна-псіхал. каштоўнасць, з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў фарміравання асобы, падтрымкі стабільнасці Я-канцэпцыі. Найб. значнасць і выключнасць Д. набывае ў юнацтве. Пазней мяняецца структура адносін, яны становяцца больш дыферэнцыраванымі і цесна звязанымі з колам інш. прыхільнасцей і сувязей (сямейных, роднасных, прафес. і інш.). Паняцце «Д.» блізкае, але не тое-

ДРУ́ЖБА, прыморскі кліматычны курорт у Балгарыі. За 9 км на ПнУ ад Варны і Залатых Пяскоў, на беразе Чорнага м. Клімат марскі, з мяккай зімой, гарачым і сухім летам. Пясчаны пляж з прылеглым мелкаводдзем. Умовы спрыяльныя для клімата- і таласатэрапіі хвароб органаў дыхання, у т.л. бранхіяльнай астмы, сардэчна-сасудзістых, нырачных, абменных, нерв. і інш.

раснае паняццям *любові, таварыскасці*, дзелавых узаемаадносін. У шырокім сэнсе Д. азначае і міжасобасныя і сац. адносіны. Д. звязвае паміж сабой групы людзей (калектывы, нацыі, народы). Д. народаў грунтуецца на ўзаемнай павазе да традыцый, культуры кожнага народа, на прызнанні іх самабытнасці і унікальнасці, правоў на самаст. вырашэнне свайго гіст. лёсу. *Л.І.Навуменка.*

ДРУ́ЖКІ, вясельныя чыны з бліжэйшай сваты маладой (незамужняя сястра, дачка хросных бацькоў, блізкія сяброўкі) або маладога (нежанаты брат, блізкія сваякі, сябры). Д. нявесты (баяркі, бальшанкі, паднявесціны, шаферкі) суправаджалі яе на працягу вяселля ў яе хаце да ад'езду ў дом маладога. Галоўнай была старшая Д., якая разам з маладой хадзіла на запросіны, удзельнічала ў выпяканні каравая, віла вянок на суборную суботу, расплятала і заплятала касу на пасадзе і г.д. Старшы Д. з боку жаніха разам з ім хадзіў запрашаць на

→ порт

вяселле радню, ехаў за маладой, садзіў маладога на пасад, трымаў вянок над яго галавой у час вянчання. Звычайна колькасць Д. была няцотнай. *Л.А.Малаш.*

ДРУ́ЖЧЫЦ (Д р у ш ч ы ц) Васіль Данілавіч (8.2.1886, в. Першамайская Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. — 20.12.1937), бел. гісторык. Скончыў Тартускі ун-т (1911). Выкладаў гісто-

В.Д.Дружчыц.

рыю ў Вільні, Шаўляі, Рэчыцы, Бабруйску. Удзельнічаў у працы *Беларускага культурна-асветнага таварыства* ў Бабруйску. З 1922 выкладчык, з 1927 праф. БДУ, адначасова з 1924 правадз. член Інбелкульта, з 1927 старшыня камісіі Інбелкульта па гісторыі гарадоў. З 1933 супрацоўнік Ін-та гісторыі Бел. АН, праф. кафедры гісторыі народаў СССР Літ. ін-та імя А.І.Герцэна (Масква). 14.1.1937 арыштаваны, 19.12.1937 асуджаны ваен. калегіяй Вярх. суда СССР да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1958. Даследаваў гісторыю Беларусі эпохі феадалізму, у т.л. магдэбургскае права ў бел. гарадах 15—18 ст., гісторыю кнігадрукавання.

ДРУЖЫ́ЛАВІЧЫ, вёска ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Іванава—в. Моталь. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на Пн ад Іванава, 152 км ад Брэста, 14 км ад чыг. ст. Янаў-Палескі. 666 ж., 243 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Мікалаеўская царква (1777).

ДРУЖЫ́НА, 1) атрад воінаў, якія аб'ядноўваліся вакол племяннога правадыра ў перыяд разлажэння родавага ладу, пазней вакол князя (караля). У стараж. *германцаў* згадваецца ў гіст. крыніцах у 1 ст. да н.э. як часовая, а з 1 ст. н.э. як пастаянная. 2) У Стараж. Русі арганізаваныя паводле пэўных прынцыпаў прафес. вайсковыя атрады пры князю, якія ўдзельнічалі ў ваен. паходах, кіраванні княствам і асабістай гаспадаркай князя. 3) Войска цалкам. 4) Карпаратыўная арг-цыя раннефеад. знаці вакол асоб княжацкага паходжання ў 9—13 ст. або асобныя яе часткі. Складаная на чале з князем іерархія дружыннікаў розных рангаў і *баяр* («старэйшая» Д.), уласна дружыннікаў і т.зв. («малодшая» Д.). У земскай Д. месца князя займала *абшчына* ў асобе вечавых устаноў. Д. выконвала ўрадавыя, адм., суд. і паліцэйскія функцыі. У ваен. сэнсе — заўжды гатовы да дзеяння аддзел пры князю ці земскай абшчыне. Да 13 ст. прыйшла ў заняпад, саступіла месца інш. прынцыпам арганізацыі пануючага класа (у прыватнасці, двару, пачалося фарміраванне *дваранства*). Канчатковае знікненне Д. даследчыкі датуюць 12—14 ст. 5) Назва кампаній, арцелей іканапісцаў (14—15 ст.), манастырскай брацыі (16 ст.).

Літ.: Горский А.А. Древнерусская дружина. М., 1989; Ласкавы Г.В. Да пытання аб арганізацыі і складзе ўзброеных сіл Полацкай зямлі ў канцы XI — пачатку XIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік памяці Міхася Ткачова. Мн., 1993. Ч. 2.

ДРУЖЫ́НА Міхаіл Афанасьевіч (н. 7.5.1922, в. Курылаўка Днепрапятроўскай вобл., Украіна), бел. спявак (бас). Засл. арт. Беларусі (1982). Скончыў Бел. кансерваторыю (1956, клас *Я.Віцінга*). З 1956 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Валодае голасам шырокага дыяпазону, добрымі сцэнічнымі данымі, свабодна адчувае сябе ў партыях лірыка-драм. і камедыйнага плана. Сярод партый нац. рэпертуару: Гадлеўскі («Яснае світанне» А.Туранкова), Прафесар, Ракоўскі («Калючая ружа», «Новая зямля» Ю.Семянякі), Палкоўнік («Надзея Дурава» А.Багатырова), Наймит («Сівая легенда» Дз.Смольскага); найб. значныя партыі з класічных опер — Сусанін («Іван Сусанін» М.Глінкі), Грэмін («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Млынар («Русалка» А.Даргамыжскага), Дасіфей, Пімен («Хаваншчына», «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Канчак («Князь Ігар» А.Барадзіна), цар Дадон («Залаты пеўнік» М.Рымскага-Корсакава), Агамемнан («Арэстэя» С.Танеева), Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно), Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Інквізітар («Дон Карлас» Дж.Вердзі), Стольнік («Галька» С.Манюшкі).

А.Я.Ракава.

ДРУЖЫ́НА Паліна Васілеўна (н. 1.6.1927, в. Палоева Чавускага р-на Магілёўскай вобл.), бел. спявачка (мецца-сапрана). Засл. арт. Беларусі (1964). Скончыла Бел. кансерваторыю (1955, клас *Я.Віцінга*). З 1955 салістка Бел. філармоніі, у 1957—83 — Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Валодае моцным прыгожым голасам вял. дыяпазону. Найб. блізкія ёй ролі лірыка-драм. плана. Сярод партый у нац. операх Марына («Яснае світанне» А.Туранкова), у класічных — Марына Мнішак («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Канчакоўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Любаша, Любава («Царская нявеста» і «Садко» М.Рымскага-Корсакава), Графіня і Паліна, Княгіня («Пікавая дама», «Чарадзейка» П.Чайкоўскага), Княгіня («Русалка» А.Даргамыжскага), Амнерыс, Ульрыка, Азучэна («Аіда», «Баль-маскарад», «Трубадур» Дж.Вердзі), Лаура і Сляпая («Джаконда» А.Панк'елі). У канцэртным рэпертуары творы бел. кампазітараў, кампазітараў-класікаў, бел. нар. песні.

А.Я.Ракава.

ДРУЖЫ́НІН Мікалай Міхайлавіч (13.1.1886, г. Курск, Расія — 8.8.1986), рускі гісторык. Акад. АН СССР (1953). Скончыў юрыд. (1911) і гісторыка-філал. (1918) ф-ты Маскоўскага ун-та. Працаваў пераважна ў Маскоўскім ун-це (1929—48), з 1938 у Ін-це гісторыі АН СССР. Аўтар прац па гісторыі эканомікі, грамадскай думкі і рэв. руху ў Расіі (пераважна 19 ст.). Дзярж. прэмія СССР 1947, Ленінская прэмія 1980.

Тв.: Декабрист Никита Муравьев. М., 1933; Государственные крестьяне и реформа П.Д.Киселева. Т. 1—2. М.; Л., 1946—58; Русская деревня на переломе, 1861—1880 гг. М., 1978.

ДРУЖЫ́НІН Міхаіл Іванавіч (н. 15.9.1920, в. Дзям'янцава Цвярской вобл., Расія), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945), ген.-палк. (1978). Скончыў Маскоўскае ваенна-паліт. вучылішча (1944), Вышэйшы ваенна-пед. ін-т (1955), Ваен. акадэмію Генштаба (1962). У Вял. Айч. вайну з 1944 на 3-м Бел. фронце. Ст. лейтэнант Д. вызначыўся ў 1944 пры вызваленні Віцебскай вобл.: узначаліў атаку батальёна, з 4 байцамі захапіў пераправу цераз р. Лучоса і ўтрымліваў яе да падыходу асн. сіл. Да 1976 у Сав. Арміі. Ганаровы грамадзянін г. Віцебск.

ДРУЗ, ш ч э б е н ь, 1) рыхлая буйнаабломкавая (псефітавая) парода, якая складаецца з востравугольных абломкаў цвёрдых парод памерам ад 10 да 100 мм. Вылучаюць па велічыні абломкаў Д. буйны (50—100 мм), сярэдні (25—50 мм) і дробны (10—25 мм). Утвараецца пры выветрыванні горных парод. Трапляецца ў выглядзе рыхлых і слабасцементаваных намнажэнняў. 2) У б у д а ў н і ц т в е — буд. матэрыял у выглядзе востравугольных абломкаў памерам 5—150 мм. Уключае прыродны Д. і прадукты спец. драблення цвёрдых горных парод, камянёў, штучных каменных матэрыялаў (цэглы і інш.). Выкарыстоўваецца як запаўняльнік для бетонных сумесей, чыг. баласт, пры буд-ве аўтадарог, гідратэхн. збудаванняў і інш.

ДРУ́ЗА (ад ням. Druse шчотка), форма мінер. агрэгата, прадстаўленага групай крышталёў, якія нараслі адным канцом (гранню або рабром) на агульную аснову — сценку поласці (*жэоды*, міяролы) або адкрытай трэшчыны ў горных паро-

Друза кварцу.

дах. Крышталі аграненыя з канца, які звернуты ў бок свабоднай прасторы. Найб. часцей трапляюцца Д. кварцу, кальцыту, розных сульфідаў (пірыту, галеніту і інш.), флюарыту.

ДРУ́ІДЫ (лац. druides), жрацы стараж. *кельтаў* Галіі, Брытаніі, Ірландыі ў 1 ст. да н.э. — 1 ст. н.э. Разам з племянной знаццю складалі пануючую праслойку. Кіравалі ахвярапрынашэннямі, ажыццяўлялі суд. функцыі, былі ўрачамі, настаўнікамі і прадказальнікамі, вял. ролю адыгрывалі ў паліт. справах. З часоў рым. акупацыі (2-я пал. 1 ст. да н.э.) узначалілі супраціўленне ўладам. Рым. імператары *Тыберый* і *Клаўдзій* забаранілі ахвярапрынашэнні Д. У 47 перасталі існаваць як асобнае саслоўе і ператварыліся ў вандроўных прадказальнікаў.

ДРУ́ЙКА, рака ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Зах. Дзвіна. Даўж. 52 км. Пл. вадазбору 1050 км^2. Выцякае з воз. Друйвяты, цячэ ў межах Браслаўскай грады, працякае праз азёры Цно, Неспіш і Недрава. Асн. прыток — ручай Плесавіца (справа). Азёры займаюць 13% вадазбору (*Браслаўская група азёр*). Даліна трапецападобная. Пойма забалочаная. Рэчышча слабазвілістае. Каля в. Друйск плаціна і сажалка б. Браслаўскай ГЭС.

ДРУЙСК, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., на р. Друйка, на аўтадарозе Браслаў—Друя. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на ПнУ ад Браслава, 230 км ад Віцебска, 11 км ад чыг. ст. Друя. 312 ж., 92 двары (1997). Цагельны з-д. Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДРУ́ЙСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 14—18 ст. у г.п. Друя Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Размяшчаўся ў сутоках Друйкі і Зах. Дзвіны. У час Лівонскай вайны 1558—83 у Д.з. ў 1561 размяшчаўся конны атрад. У ходзе ваен. падзей 16—17 ст. замак зведаў шматлікія аблогі і штурмы, неаднаразова быў разбураны і спалены. Пасля вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 адноўлены, але сваёй магутнасцю не вылучаўся. У 18 ст. паступова прыйшоў у заняпад.

ДРУ́ЙСКІ КЛЯ́ШТАР БЕРНАРДЗІ́НЦАЎ, помнік архітэктуры барока. Пабудаваны ў 1643—46 у г.п. Друя Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. па фундацыі падканцлера ВКЛ Казіміра Сапегі. Комплекс уключае касцёл, кляштарны корпус, браму з агароджай. Касцёл — мураваная 3-нефавая 1-вежавая базіліка. На гал. фасадзе тарцы бакавых нефаў закрыты невял. аб'ёмамі з пластычнымі валютамі над імі, тарцы цэнтр. нефа — масіўнай 4-яруснай чацверыковай вежай-званіцай, завершанай купалам (дабудавана ў 1772). Інтэр'ер аздоблены ордэрнай пластыкай, лепкай у тэхніцы стука. Скляпенні захавалі дэкор 17 ст. ў выглядзе ляпных геам. кесонаў. Галоўны 2-ярусны алтар у стылі позняга барока выкананы ў 1764—67, амбон і 4 бакавыя алтары з элементамі стылю ракако — у 1779. З Пн да касцёла прылягае 2-павярховы мураваны будынак кляштара, які ўтварае прамавугольны замкнёны двор, з 3 бакоў абкружаны калідорам. Ансамбль дапоўнены мураванай арачнай агароджай з брамай (пабудавана ў 1778).

З 1852 касцёл стаў прыхадскім. У 1923—29 у памяшканнях б. кляштара бернардзінцаў дзейнічаў кляштар айцоў марыянаў (засн. па ініцыятыве віленскага біскупа і генерала ордэна марыянаў Ю.Матулевіча). У 1924 манахі-беларусы ордэна марыянаў арганізавалі школу (з 1930 гімназія імя Стафана Баторыя; у 1924—33 дырэктар А.Цікота). Гімназія вылучалася дэмакр. традыцыямі. У ёй вучыліся будучыя гісторык В.Ярмалковіч, пісьменнік Я.Германовіч, мастак В.Жаўняровіч, рэліг. дзеяч, заснавальнік б-кі імя Ф.Скарыны ў Лондане Ч.Сіповіч, д-р філасофіі Т.Падзява і інш. Марыяне падтрымлівалі Бел. хрысціянскую дэмакратыю, садзейнічалі адкрыццю бел. друкарні імя Ф.Скарыны ў Вільні, фінансавалі выданне бел. перыёдыкі і л-ры. З-за бел. накіраванасці да кляштара варожа ставіліся польскія свецкія і рэліг. ўлады. У канцы 1939 кляштар і гімназія зачынены сав. ўладамі. Некаторыя айцы марыяне знайшлі прытулак у лонданскім бел. марыянскім доме, заснаваным у 1964 ксяндзом Сіповічам.

Літ.: Туронак Ю. Да гісторыі Друйскага Марыянскага манастыра // Браслаўскія чытанні. Браслаў, 1991; Яго ж. Беларускія Марыяны ў Друі // Спадчына. 1991. № 5.

Т.В.Габрусь, К.С.Шыдлоўскі.

ДРУ́ЙСКІ КЛЯ́ШТАР ДАМІНІКА́НЦАЎ. Існаваў у 1706—1832 у Друі. Засн. браслаўскім падчашым П.К.Качаноўскім. Мураваныя касцёл і жылы корпус пабудаваны ў 2-й пал. 18 ст. па праекце італьян. архітэктара Парака. Касцёл св. Антонія асвячоны ў 1767 бел. біскупам-суфраганам Ф.Тавянскім. У 1839 будынкі кляштара перададзены праваслаўным; мясц. памешчык Мілаш царскім загадам быў абавязаны пераабсталяваць касцёл у царкву, але потым выдаткі былі перакладзены на прыхаджан. З-за адсутнасці сродкаў работы не выконваліся. У канцы 19 ст. кляштар разабраны на цэглу, касцёл узарваны ў 1909.

А.А.Ярашэвіч.

Друйскі кляштар бернардзінцаў. Галоўны фасад.

ДРУ́ЙСКІ ПАРК, помнік сядзібна-паркавага мастацтва. Закладзены ў пач. 19 ст. ў г.п. Друя Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Парк рэгулярнага тыпу. Пл. каля 4 га. Цэнтр кампазіцыі — мураваны 1-павярховы палац на левым беразе Зах. Дзвіны (будынак неаднаразова перабудоўваўся і страціў пачатковы выгляд). Парк выцягнуты з У на З, у паўд. ч. зберагліся алеі, у заходняй — старыя ліпы. Растуць мясц. пароды дрэў, у т.л. конскі каштан звычайны, вяз шурпаты ніцы і інш.

В.Р.Анціпаў.

ДРУК, у шырокім значэнні — уся друкаваная прадукцыя, у больш вузкім — перыядычныя выданні, пераважна газеты і часопісы. Як адзін са сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды адыгрывае значную ролю ў развіцці асветы і культуры, фарміраванні светапогляду, пашырэнні навук. ведаў і інш. Гл. *Выдавецкая справа, Газета, Кніга, Часопіс, Кнігадрукаванне, Перыядычны друк, Заходнебеларускі друк, Друк акупацыйны, Друк падпольны.*

ДРУК АКУПАЦЫ́ЙНЫ ў Вялікую Айчынную вайну, выданні, якія выходзілі ў 1941—44 на акупіраванай ням. фашыстамі тэр. Беларусі. Выдаваўся ням. адміністрацыяй (цывільнай і ваеннай), бел. легальнымі арг-цыямі і фарміраваннямі для прапаганды палітыкі і практыкі ням.-фаш. улад, забеспячэння эфектыўнасці кіравання на захопленых тэрыторыях, захавання лаяльнасці мясц. насельніцтва, барацьбы з партыз. рухам і ўплывам камуніст. ідэалогіі. На тэр. Беларусі выходзіла каля 100 легальных перыяд. выданняў (разам з аднадзёнкамі і нерэгулярнымі выданнямі) на бел., рус., ням., часткова ўкр. мовах (газеты выдаваліся раз у 3—7 дзён, часопісы раз у 1—2 месяцы); на бел. мове выдаваліся адм. структурамі акупац. улад і падкантрольнымі ім установамі-аддзеламі прэсы, прапаганды, культуры гебітскамісарыятаў і гар. управаў, спецыялізаванымі выд-вамі (газ. *«Голас вёскі»*, *«Беларуская газэта»*, *«Слонімскі кур'ер»*, час. *«Беларуская школа»*, *«Новы шлях»* і інш.) або грамадскімі арг-цыямі — бел. нац. к-тамі, культ. згуртаваннямі, прафс. арг-цыямі, цэнтр. і рэгіянальнымі структурамі Бел. нар. самапомачы, Саюза бел. моладзі (газ. *«Беларускі голас»*, час. «Жыве Беларусь!» і інш.). Тэматычна да гэтай групы выданняў прымыкала бел. перыёдыка ў Германіі (газ. «Раніца», *«Беларускі работнік»*, час. «Беларускі студэнт», «Малады змагар»), распаўсюджанне якой на Беларусі было вельмі абмежавана. На старонках легальнай прэсы друкаваліся загады і распараджэнні акупац. улад, прамовы кіраўнікоў фаш. Германіі, тэндэнцыйная інфармацыя пра баявыя дзеянні на франтах 2-й сусв. вайны і міжнар. падзеі, агляды перыёдыкі краін саюзнікаў Германіі, публікацыі пра эканам., паліт., сац., ваен.

сітуацыю ў Беларусі, дзейнасць легальных арг-цый і фарміраванняў, успаміны бел. эмігрантаў, навукова-папулярныя артыкулы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі, праблемах развіцця культуры, асветы, навукі, мовы, агляды культ. жыцця і г.д. Ваен. ўлады тылавога раёна групы армій «Цэнтр», камандаванне рус. калабарацыянісцкіх вайск. фарміраванняў, антысав. арг-цыі прарус. арыентацыі выдавалі на рус. мове газ. «Новый путь» (Баранавічы, Бабруйск, Барысаў, Віцебск, Гомель, Лепель, Магілёў і інш.), «Боевой путь» (Дзятлава), «Казак» (Навагрудак) і інш. Асобную групу складалі перыяд. выданні на ням. мове — зборнікі нарматыўных актаў, загадаў, распараджэнняў і інфармацый акупац. улад, штодзённая газ. «Minsker Zeitung» («Мінская газета»). У паўд. ч. Беларусі, якая ўваходзіла ў склад рэйхскамісарыята «Украіна», распаўсюджваліся газеты на ўкр. мове — «Наше слово» (Брэст) і «Пиньска газета» (Пінск). З прапагандысцкімі мэтамі выкарыстоўваліся таксама плакаты (іх друкавалі пераважна за межамі Беларусі) і лістоўкі.

Літ.: Библиография оккупационных периодических изданий, выходивших на территории Белоруссии в 1941—1944 гг. Мн., 1995.
С.У.Жумар.

ДРУК ПАДПО́ЛЬНЫ ў Вялікую Айчынную вайну, выданні, якія выпускалі ЦК КП(б)Б, падп. абласныя, міжраённыя, раённыя, парт. і камсамольскія к-ты, партыз. фарміраванні на акупіраванай ням. фашыстамі тэр. Беларусі. Асвятляў становішча на франтах, працу і жыццё насельніцтва ў тыле ворага, міжнар. падзеі. Першымі падп. выданнямі былі лістоўкі і звароты да насельніцтва, машынапісныя газеты і бюлетэні. З канца 1941 у Мінску падп. група А.А.Маркевіча друкавала лістоўкі, у студз.—жн. 1942 — малафарматную газ. «*Патриот Родины*» (выйшла 8 нумароў). Першым нелегальным друкаваным выданнем быў «*Вестник Родины*» Мінскага падп. гаркома КП(б)Б. Значнай з'явай у Д.п. быў выхад у маі—вер. 1942 4 нумароў газ. «*Звязда*» тыражом больш за 10 тыс. экз. (адноўлены ў студз. 1943). На тэр. Віцебскай вобл. ў прыфрантавой паласе друкавалася газ. «*Віцебскі рабочы*». У 1942 друкарскім спосабам выдаваліся 6 раённых, 1 міжраённая газета — органы Клічаўскага, Рудзенскага, Бярэзінскага, Бабруйскага, Віцебскага, Чэрвеньскага падп. райкомаў КП(б)Б. Для ўзмацнення прапагандысцкай работы 15.12.1942 ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне стварыць у снеж. 1942 — студз. 1943 10 абл. і 50 раённых падп. друкарняў. У 1943—44 пачалі выходзіць абл. камсамольска-маладзёжныя газеты «Молодой мститель» Баранавіцкага, «Молодой партизан» Беластоцкага і «Молодежная правда» Вілейскага падп. абкомаў ЛКСМБ. Паліторганы партыз. фарміраванняў, у т.л. партыз. брыгад «Разгром», «Народныя мсціўцы» імя В.Т.Варанянскага, 16-я Смаленская, выдавалі больш за 120 шматтыражных газет. Свае газеты выдавалі антыфашысцкія камітэты. У 1942—43 выходзілі 134 газеты. Усяго за перыяд акупацыі на тэр. Беларусі выдавалася больш за 160 газет. З-за цяжкасцей выпуску, недахопу паперы тыраж падп. газет вагаўся ад некалькіх соцень да тысячы і больш экз., розным быў і іх фармат. Падпольна друкаваліся і распаўсюджваліся звароты ЦК КП(б)Б і ўрада рэспублікі, паліторганаў Чырв. Арміі да насельніцтва, зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі, у партыз. фарміраваннях — рукапісныя часопісы, насценныя газеты, баявыя лісткі; распаўсюджваліся і газеты, што выдаваліся ў сав. тыле «*Савецкая Беларусь*», «*За Савецкую Беларусь*», «*За свабодную Беларусь*», сатырычныя выданні «*Раздавім фашысцкую гадзіну*», «*Партызанская дубінка*», «Блокнот агітатора-партызана», час. «*Беларусь*». У падп. газетах часта друкаваліся надзённыя творы бел. пісьменнікаў.

Літ.: Адамовіч В.С. Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Бібліягр. паказ. Мн., 1975; Друк Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945) // Булацкі Р.В., Сачанка І.І., Говін С.В. Гісторыя беларускай журналістыкі. Мн., 1979.
Г.Л.Напрэеў.

ДРУКАВА́ЛЬНАЯ ПРЫЛА́ДА ў вылічальнай тэхніцы, перыферыйная прылада для пераўтварэння выхадных даных ЭВМ, лічбавых вымяральных або інш. прылад і іх аўтам. друку на носьбіце інфармацыі (пераважна на паперы) у выглядзе літар, лічбаў і інш. сімвалаў. Забяспечвае атрыманне дакументаў з вынікамі апрацоўкі даных у форме, зручнай для ўспрымання чалавекам: тэкст, табліцы, графікі і інш.

Работа Д.п. заснавана на мех. (ударны запіс на носьбіце з дапамогай фарбавальнага элемента) і немех. (з дапамогай светлавога промня, імпульсаў эл. току, струменяў фарбавальнага рэчыва і інш.) спосабах рэгістрацыі інфармацыі. Д.п. бываюць знакадрукавальныя (напр., алфавітна-лічбавыя) і знакасінтэзавальныя (*прынтэры*; знакі фарміруюцца з асобных элементаў — кропак, рысак і інш.; даюць магчымасць выводзіць любыя сімвалы і графічную інфармацыю); пасімвальныя (знакі выводзяцца паасобку, як у пішучай машынцы), парадковыя (знакі аднаго радка друкуюцца адначасова) і пастаронкавыя (друкуецца цалкам старонка); аркушавыя (інфармацыя запісваецца на асобныя аркушы паперы) і рулонныя (на рулон паперы, які потым разразаецца на аркушы).
М.П.Савік.

ДРУКАВА́ННЕ, працэс атрымання адбіткаў шляхам пераносу фарбы з друкарскай формы на паперу, тканіну, кардон, пластмасу, метал і інш. матэрыялы. Асн. віды Д. ў паліграфіі: *высокі друк*, *плоскі друк* (у т.л. *афсетны друк*), *глыбокі друк*. Пашыраны таксама *трафарэтны друк* і *электраграфія*. Гл. таксама *Кнігадрукаванне*, *Нотадрукаванне*, *Друкаванне тканін*.

ДРУКАВА́ННЕ ТКАНІ́Н, нанясенне на тканіны ўзорыстых адна- або шматфарбавых малюнкаў. Робіцца цыліндрычнымі друкарскімі машынамі, сеткаватымі шаблонамі, спосабам аэраграфіі (распыленне сціснутым паветрам) і ўручную.

Перад друкаваннем тканіну прамываюць, адварваюць, адбельваюць, хларыруюць і інш. Пасля нанясення фарбы яе сушаць і апрацоўваюць у вільготным асяроддзі пры высокай т-ры, паўторна прамываюць. Для Д.т. выкарыстоўваюць актыўныя, кубавыя, кіслотныя, дысперсныя і інш. *фарбавальнікі*, а таксама розныя згушчальнікі фарбаў. Ручным або аэраграфічным спосабамі друкуюць паштучныя або індывідуальныя высокамаст. вырабы, друкарскімі машынамі і сеткаватымі шаблонамі — тканіны масавага асартыменту.

ДРУКА́РНЯ, паліграфічнае прамысловае прадпрыемства, якое выпускае разнастайную друкаваную прадукцыю (кнігі, газеты, часопісы, брашуры, бланкі, ноты і інш.). На Беларусі ў залежнасці ад формы дзярж. ўласнасці іс-



Адна з першых **друкарскіх машын** (прэс): 1 — дэкель для ўкладкі паперы; 2 — талер (металічная пліта) для ўстаноўкі друкарскай формы; 3 — друкарская форма; 4 — вінтавы прэс.



Схемы друкавальных прыстасаванняў **друкарскіх машын**: *а* — тыгельнай; *б* — плоскадрукавальнай; *в* — ратацыйнай; *г* — афсетнай; 1 — друкарская форма; 2 — плоская аснова — талер (або формны цыліндр); 3 — тыгель (або друкавальны цыліндр); 4 — папера; 5 — дэкель; 6 — перадатачны (афсетны) цыліндр.

нуюць Д. дзярж. (рэспубліканскія, абласныя, раённыя) і недзяржаўныя. Для забеспячэння тэхнал. працэсу Д. найчасцей маюць цэхі (наборны, формны, друкарскі, брашуровачна-пераплётны), дапаможныя службы (рамонтна-мех. цэх, падрыхтоўкі паперы), лабараторыі, складскія памяшканні і інш. У сучасных Д. найб. пашыраны афсетны друк.

Заснавальнікам першай прыватнай Д. ў Еўропе (1438) быў нямецкі вынаходнік друку І.*Гутэнберг*. Першай дзярж. Д. быў *Друкарскі двор* у Маскве (каля 1563).

Першая Д. на Беларусі заснавана Ф.Скарынай каля 1520 у сталіцы ВКЛ Вільні. На тэр. сучаснай Беларусі першая Д. засн. ў Брэсце ў пач. 1550-х г. Найбольшыя ў 16—17 ст. *Брэсцкія друкарні*, *Нясвіжская друкарня*, *Еўінская друкарня*, Д. Мамоніча. У 2-й пал. 18 ст. працавалі Д. Віцебская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская губернскія. На пач. 20 ст. налічвалася 123 Д. і літаграфічныя прадпрыемствы.

На 1.1.1997 у Беларусі 341 Д., у т.л. 135 дзяржаўных. Найбольшыя з іх: Вытворча-паліграфічнае прадпрыемства імя Я.Коласа, *Мінская фабрыка каляровага друку*, *Беларускі Дом друку*. *А.І.Раковіч*.

ДРУКА́РСКАЯ МАШЫ́НА паліграфічная, машына для шматразовага атрымання аднолькавых адбіткаў тэксту, ілюстрацый і інш. на паперы (або інш. матэрыяле) з адпаведнай *друкарскай формы*. Асн. вузлы Д.м.: друкавальны і фарбавальны апараты, прыстасаванні для падачы паперы і перамяшчэння яе ў машыне, вываду гатовай прадукцыі.

Адрозніваюць Д.м.: *высокага друку*, *глыбокага друку* і *плоскага друку*, у т.л. *афсетнага друку*; тыгельныя (да плоскай друкарскай формы папера прыціскаецца плоскасцю т.зв. тыгля), плоскадрукавальныя (да плоскай формы папера прыціскаецца цыліндрам) і ратацыйныя (форма і прыціскальная паверхня цыліндрычныя, верцяцца з аднолькавай скорасцю). Папера можа падавацца аркушамі (аркушавая Д.м.) або з рулона (рулонныя). Найб. прадукцыйныя ратацыйныя рулонныя Д.м. Першая Д.м. (плоскадрукавальная) створана ням. вынаходнікам Ф.Кёнігам у 1811, машыны розных тыпаў пачалі выкарыстоўваць ў пач. і сярэдзіне 19 ст. ў Германіі, Англіі, ЗША і інш.

Літ.: Полянский Н.Н. Технология полиграфического производства. Ч. 2. М., 1982.

ДРУКА́РСКАЯ ФО́РМА, плоская або цыліндрычная форма, якая ў сістэме друкавальных (даюць адбіткі фарбы на матэрыяле) і прабельных (прамежкавых) элементаў мае тэкставую і ілюстрацыйную інфармацыю і служыць для шматразовага атрымання *адбіткаў*. Выкарыстоўваецца ў *друкарскіх машынах*.

Бывае для *высокага друку* (набор, *кліш*э, фотапалімерная форма, стэрэатып), *плоскага друку* (афсетныя, літаграфскія і фотатыпныя пласціны), *глыбокага друку* (пакрытыя меддзю і храміраваныя цыліндры), а таксама для металаграфскага, трафарэтнага, электраграфічнага і інш. спец. відаў друку. Матэрыялы Д.ф. — металічныя (друкарскія сплавы, цынк, алюміній, медзь, магній, біметал і інш.), неметалічныя (пластмаса, гума, шкло і інш.) і камбінаваныя. Д.ф. робяць фотанаборнымі, наборна-друкавальнымі і наборна-адліўнымі спосабамі, стэрэатыпныя формы — метадамі гальванапластыкі, прасаваннем і ліццём. З адной Д.ф. можна атрымаць 1 млн. і болей адбіткаў.

Літ.: Колосов А.И. Наборные и стереотипные процессы. М., 1977.



Схема рулоннай афсетнай кніжна-часопіснай **друкарскай машыны**: 1 — рулон паперы; 2 — трохцыліндравыя аднафарбавыя друкавальныя секцыі; 3 — штангі для пераварочвання папяровага палатна; 4 — фальцавальны апарат.

ДРУКА́РСКІ ДВОР у Маскве, найбуйнейшая рас. друкарня ў 16 — пач. 20 ст.; першая дзярж. друкарня ў Расіі. Засн. каля 1563 пры падтрымцы цара Івана IV Грознага і мітрапаліта Макарыя на тэр. Кітай-горада ў старой ч. Масквы (раён Нікольскай вуліцы). Тут былі надрукаваны першыя рас. кнігі «Апостал» (1564), «Часоўнік» (1565, абедзве выдадзены ўраджэнцамі Беларусі І. *Фёдаравым* і П. *Мсціслаўцам*), «Псалтыр» (1568, друкары Андронік Цімафееў Нявежа і Нічыпар Тарасіеў). Пасля 1568 да 1587 кнігі часова друкаваліся ў Аляксандраўскай слабадзе (сучасны г. Аляксандраў Уладзімірскай вобл.). Пасля пажару 1611 на тым самым месцы пабудаваны новы Д.д. (дзейнічаў з 1614); у 1645 і 1679 ён перабудаваны. У 17 ст. на Д.д. (з канца 17 ст. наз. друкарняй) выдадзена больш за 500 кніг (сярэдні тыраж кнігі каля 1200 экз.), пераважна рэліг. зместу; сярод свецкіх кніг была «Граматыка» (1648) ураджэнца Беларусі М.*Смотрыцкага*. У 1712 частка станкоў перавезена ў Пецярбург. У 1721 друкарня перададзена Сіноду і перайменавана ў Маскоўскую сінадальную друкарню (існавала да 1917).

Літ.: Лабынцев Ю.А. Улица 25 Октября, 15. М., 1986.

С.Друкер у ролях Адаркі (злева) і Тоскі.

С.Ю.Друкер.

ДРУ́КЕР Соф'я Юр'еўна (7.1.1907, г.п. Копысь Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 23.4.1984), бел. спявачка (драм. сапрана). Нар. арт. Беларусі (1955). Скончыла Бел. студыю оперы і балета пад кіраўніцтвам А.*Баначыча* (1933), вучылася ў Бел. кансерваторыі (1932—36,

клас П.Ціханава). У 1933—41 і 1944—77 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Валодала моцным голасам прыемнага тэмбру, высокай вак. культурай, муз.-драм. здольнасцямі, якія дазвалялі ёй выконваць разнапланавыя ролі: ад глыбока драматычных (Аўтіння ў оперы «У пушчах Палесся» А.Багатырова) да востра камедыйных (Рагнеда Янаўна ў «Калючай ружы» Ю.Семянякі). Майстэрства стварэння драматычна напружаных, багатых псіхал. адценнямі вобразаў найб. выявілася ў партыях опернай класікі: Яраслаўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Наташа («Русалка» А.Даргамыжскага), Ліза, Марыя, Настасся, Аксана («Пікавая дама», «Мазепа», «Чарадзейка», «Чаравічкі» П.Чайкоўскага), Аіда («Аіда» Дж.Вердзі), Тоска («Тоска» Дж.Пучыні). Сярод каларытных камедыйных вобразаў: Часнікова («Страшны двор» С.Манюшкі), Адарка («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Дуэнья («Заручыны ў манастыры» С.Пракоф'ева), Фроська («Марозка» М.Красева), Мірабела («Цыганскі барон» І.Штрауса). Шмат выступала ў канцэртах, у т.л. з творамі бел. кампазітараў.

Літ.: Жураўлёў Д. Соф'я Друкер // Слова пра майстроў сцэны. Мн., 1967.

Дз.М.Жураўлёў.

ДРУКТ Аляксандр Анатолевіч (10.5.1949, Мінск — 17.4.1990), бел. музыказнавец, кампазітар. Канд. мастацтвазнаўства (1978). Скончыў Бел. кансерваторыю (1972), выкладаў у ёй. У навук. дзейнасці асн. ўвагу аддаваў праблемам натуральна-ладавай гармоніі, ладаўтварэння ў сучаснай музыцы, класічнай поліфаніі. Сярод муз. твораў: «Званы» (1978) і «Вяснянка» (1982) для аркестра нар. інструментаў, квінтэт (1982), «Гарэзлівыя прыпеўкі» для 2 цымбалаў, фп. і ўдарных (1983), «Балбатухі» для 2 домраў, фп. і ўдарных (1987) і інш.

Тв.: Фартэпіянны цыкл Л.Абеліёвіча «Фрэска № 1»: (Да праблемы адзінства цыкла) // Бел. музыка. Мн., 1978. Вып. 3; О композиционном строении двухголосных инвенций Баха. Мн., 1979; Сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё. Мн., 1984; Об опере С.Кортеса «Матушка Кураж» // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3; Развитие белорусской советской музыки: опыт стадиального описания // Белорусская советская музыка на современном этапе. Мн., 1990.

Р.М.Аладава.

ДРУ́КША, рака, гл. *Дрысвята.*

ДРУ́МЛІНЫ (англ. drumlin, адз.л.), прадаўгавата-авальныя ўзгоркі, выцягнутыя па падоўжнай восі ў напрамку руху б. ледавіка. Даўж. ад некалькіх соцень метраў да 2—3 км, шыр. ад 100 да 400 м, выш. ад 5 да 45 м. Складзены пераважна з асн. марэны, часта маюць ядро з флювіягляцыяльных пяскоў ці карэнных парод. Паходжанне Д. найчасцей звязваюць з працэсамі падлёднай акумуляцыі і ледавіковай эрозіі. Месцамі Д. ўтвараюць т.зв. друмлінавыя палі, у самым вял. з іх (штат Нью-Йорк, ЗША) каля 10 тыс. Д. На Беларусі Д. трапляюцца ў Паазер'і.

ДРУ́НІНА Юлія Уладзіміраўна (10.5.1924, Масква — 21.11.1991), руская паэтэса. Скончыла Літ. ін-т імя М.Горкага (1952). У Айч. вайну санінструктар на фронце. Друкавалася з 1945. Вызначальнае ў вершах — памяць пра вайну, праблемы і клопаты сучасніка, яго духоўны свет (зб-кі «У салдацкім шынялі», 1948, «Размова з сэрцам», 1955, «Сучаснікі», 1960, «Ты вернешся», 1968, «Не бывае любві нешчаслівай...», 1973, Дзярж. прэмія Расіі 1975, «Акопная зорка», 1975, «Бабіна лета», 1980, «Сонца — на лета», 1983, і інш.). Аўтабіягр. аповесць «З тых вяршыняў» (1979), вершы «Зінка», «Памяці Клары Давыдзюк», «Песня вязня», «У пярэдзень вайны» і інш. тэматычна звязаны з Беларуссю. Аўтар паэмы «Нуль тры» (1980). На бел. мову творы Д. перакладалі Э.Агняцвет, С.Басуматрава, Т.Бондар, С.Гаўрусёў, Х.Жычка, Ю.Свірка, І.Скурко і інш.

Тв.: Избр. произв. Т. 1—2. М., 1981.

мастацтваў (1924), Ленінградскую кансерваторыю (1925), з 1935 выкладаў у ёй (праф. з 1947). Вучыўся ў *Б.Асаф'ева* і інш. Даследаваў замежную і рус. музыку, оперную і балетную драматургію, муз. гістарыяграфію.

Тв.: Новая фортепианная музыка. Л., 1928; Вопросы музыкальной драматургии оперы: На материале классич. наследия. Л., 1952; История и современность. Л., 1960; Зарубежная музыка первой половины XIX в. М., 1967; О западно-европейской музыке XX в. М., 1973; И.Стравинский. 2 изд. Л., 1979; И.С.Бах. М., 1982; Очерки, статьи, заметки. Л., 1987.

ДРУ́СКІНІНКАЙ (Druskininkai), горад у Літве, на р. Нямунас (Нёман). Вядомы з 1635, да 1939 наз. Друскенікі. 21,8 тыс. ж. (1997). Чыг. станцыя. Суднаходства па р. Нёман да Гродна.

Бальнеагразевы і кліматычны курорт. Першыя купальні пабудаваны ў 1837. Мяккі клімат з цёплым летам, мясц. мінер. воды і тарфяныя гразі — асн. лек. фактары пры хваробах страўнікава-кішачнага тракту, печані і жоўцевых шляхоў, нерв. і сардэчна-сасудзістай сістэм, лёгачных (нетуберкулёзнага паходжання), органаў апоры і руху, гінекалагічных, абмену рэчываў. У Д. каля 10 санато-

Знаходкі на дзядзінцы **Друцка**: 1 — бронзавы крыж-энкалпіён; 2 — сярэбраная падвеска; 3 — касцяная шахматная фігурка; 4 — капавушка; 5 — пісала; 6 — амулет; 7 — шыферная праслiца з надпісам; 8 — грэбень.

«ДРУ́РЫ-ЛЕЙН» (Drury Lane), англійскі драматычны тэатр. Створаны ў 17 ст. У 18—19 ст. меў манаполію на пастаноўку сур'ёзнай драмы. Гэта абумовіла высокі маст. ўзровень рэпертуару («Д.-Л.» называюць «Домам англ. драмы») і прывабіла шмат таленавітых англ. акцёраў. Тут выступалі: *Д.Гарык*, *С.Сіданс*, Дж.*Кембл*, Э.*Кін*, У.*Макрэдзі*. У рэпертуары разам з лепшымі творамі нац. драматургіі ставіліся таксама пантамімы і меладрамы.

Будынак узведзены ў 1663. Пацярпеў ад пажараў (1672, 1809) і ад бамбёжкі (1940). Адноўлены. Цяпер пастаяннай трупы не мае, выкарыстоўваецца для гастрольных спектакляў.

ДРУ́СКІН Міхаіл Сямёнавіч (14.1.1905, Кіеў — 21.4.1991), расійскі музыказнавец, піяніст, педагог. Засл. дз. маст. Расіі (1962). Д-р мастацтвазнаўства (1946). Скончыў Ленінградскі ін-т гісторыі

рыяў (у т.л. санаторый «Беларусь»), пансіянаты, бальнеагразелячэбніца, пітная галерэя, аэрасалярыі, каскадныя купальні і інш. Мемар. музей М.К.*Чурлёніса*, музей лесу, ландшафтны заказнік у даліне Рэйгардас.

ДРУЦК (летапісны Дрютьск, Дрьтеск, Дрьютск), старажытны горад *Полацкай зямлі*. Знаходзіўся каля сучаснай в. Друцк Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Узнік на высокім правым беразе р. Друць на адным з адгалінаванняў *шляху «з варагаў у грэкі»*. Паводле сведчання *Друцкага евангелля* 14 ст., існаваў ужо ў канцы 10 ст. У летапісах упершыню ўпамінаецца пад 1092. З 1-й пал. 12 ст. цэнтр *Друцкага княства*, якім валодалі нашчадкі полацкага кн. Усяслава Брачыславіча. У 1116 разбураны войскамі паўд.-рус. князёў. З 1180 уцягнуты ў барацьбу смаленскіх князёў з чарнігаўскімі. Найб. росквіту дасягнуў у 1230—40-я г. З 13 ст. ў складзе ВКЛ. З 14 ст. існаваў *Друцкі замак.*

Новы прамы шлях з Вільні ў Маскву праз Талачын паскорыў заняпад Д.

Дзядзінец стараж. Д. (пл. каля 1 га) быў умацаваны валам і ровам. З Пн да дзядзінца прымыкаў вакольны горад, умацаваны таксама валам і ровам. На абодвух валах знаходзіліся вежы з сістэмай двайных брам і сцены-гародні. За сценамі горада размяшчаўся неўмацаваны пасад. Археал. раскопкі Д. праводзілі ў 1930 А.Дз.Каваленя, у 1956—62, 1965, 1967 Л.В.Аляксееў. *Л.В.Аляксееў.*

ДРУ́ЦКАЕ ЕВА́НГЕЛЛЕ, рукапісны помнік усх.-слав. пісьменства 14 ст. Укладзена кн. Васілём Міхайлавічам Друцкім і яго жонкай Васілісай у царкву Багародзіцы ў Друцку (Талачынскі р-н), у 1441 — віленскім месцічам Конанам у царкву Уваскрэсення Хрыстова ў Вільні, у 18 ст. належала архіепіскапу наўгародскаму Феадосію Яноўскаму.

Напісана на царк.-слав. мове ўставам на 376 старонках фарматам «у аркуш». Тэкст размешчаны ў 2 калонкі па 25—28 радкоў у кожнай. Важнае культ.-гіст. значэнне маюць запісы ў канцы рукапісу, якія сведчаць пра існаванне Друцка ўжо ў 10 ст. і пабудову першай царквы ў гэтым горадзе ў 1001. Маст. аздабленне — застаўкі і 54 ініцыялы тэраталагічнага характару, выкананыя чырвонай фарбай (кінавар). Зберагаецца ў 6-цы Сібірскага аддзялення Рас. АН.

Літ.: Тихомиров М.Н. Описание Тихомировского собрания рукописей. М., 1968. С. 9—11. *С.А.Акуліч.*

ДРУ́ЦКАЕ КНЯ́СТВА. Існавала ў 12—16 ст.; адзін з удзелаў, на якія ў 12 ст. распалася *Полацкая зямля*. Утворана, магчыма, пасля смерці кн. Усяслава Брачыславіча (1101) як удзел яго сына Барыса. Пасля Д.к. належала сынам апошняга Рагвалоду і Івану, менскаму кн. Расціславу Глебавічу і яго сыну Глебу (з 1151), зноў Рагвалоду Глебавічу (з 1158), яго сынам Глебу (1180) і Усяславу (1186) і мяркуемаму ўнуку Барысу (1197). У 13 — пач. 14 ст. ў Д.к., верагодна, правіла мясц. дынастыя, якая ў 1-й пал. 14 ст. трапіла ў васальную залежнасць ад Гедзіміна ці яго сына Альгерда. Пасля заняцця Альгердам вялікакняжацкага пасада (1345) Д.к. ўвайшло ў ВКЛ. У 2-й пал. 14 — 1-й пал. 15 ст. яно ахоплівала тэрыторыю паміж Барысаўскай вол. на З, Лукомскім княствам і Аболецкай вол. на Пн, Аршанскай і Копыскай вол. на У, Цяцерынскай вол. на Пд (часткі сучасных Талачынскага, Крупскага і Круглянскага р-наў). З 2-й пал. 15 ст. Д.к. пачало распадацца ў сувязі з падзелам яго тэр. паміж асобнымі галінамі кн. *Друцкіх*. Маёнткі Багрынава, Гольцава, Шыйкі адышлі да вял. князя і былі падараваны кн. Адзінцэвічам. *Друцкі замак* заставаўся ў сумесным валоданні ўсіх кн. Друцкіх. З канца 15 ст. ў выніку згасання некат. галін кн. Друцкіх іх долі ў Д.к. перайшлі да інш. феад. родаў: кн. Ямантовічаў, Гаштольдаў, Іллінічаў, Гарнастаяў, Сапегаў. У 16 ст. Д.к. канчаткова ператварылася ў канглamерат самастойных феад. вотчын. Пасля адм. рэформы ў ВКЛ 1565—66 яго тэр. цалкам уключана ў *Аршанскі павет*.

В.Л.Насевіч.

ДРУ́ЦКІ ЗА́МАК. Існаваў 14—17 ст. ў сярэдневяковым г. *Друцк* (каля сучаснай в. Друцк Талачынскага р-на Віцебскай вобл.). Быў абнесены высокім валам і глыбокім ровам. Звесткі пра замак ёсць у дакументах за 1544, 1545 і 1549, у «Хроніцы Еўрапейскай Сарматы» (1578, 1581) А.Гваньіні. Д.з. пастаянна пазначаўся на картах Еўропы за 1562, 1589, 1595 і 1613. Заняпаў, верагодна, у сярэдзіне 17 ст. У дакументах перыяду вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 пра Д.з. не ўпамінаецца.

Гарадзішча старажытнага **Друцка**.

ДРУ́ЦКІ-ПАДБЯРО́ЭСКІ Рамуальд Андрэевіч, гл. *Падбярэскі* Р.А.

ДРУ́ЦКІЯ, старажытны княжацкі род герба «Друцк». Паходзяць, верагодна, ад кн. *Рагвалода Рагвалодавіча*, які пасля паражэння ў 1161 у барацьбе за полацкі трон замацаваў за сабой *Друцкае княства* (адсюль прозвішча яго нашчадкаў). У 1-й пал. 14 ст. Д. падзяліліся на 2 лініі: старэйшую (ад кн. Васіля Міхайлавіча), прадстаўнікі якой пасля ўдзелу ў *Глінскіх мяцяжы 1508* выехалі ў Маскву, і малодшую (ад кн. Сямёна Міхайлавіча), прадстаўнікі якой засталіся ў ВКЛ і падзяліліся на некалькі галін, атрымаўшы другія прозвішчы ад сваіх маёнткаў (Д.-Азярэцкія, *Друцкія-Горскія*, *Друцкія-Любецкія*, *Друцкія-Саколінскія* і інш.) і ад мянушак заснавальнікаў асобных галін роду (Д.-Адзінцэвічы, Д.-Бабічавы, Д.-Канопліі, Д.-Пуцяцічы і інш.).

Літ.: Насевіч В.Л. Род князёў Друцкіх у гісторыі Вялікага княства Літоўскага (XIV—XVI стст.) // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. *В.Л.Насевіч.*

ДРУ́ЦКІЯ-ГО́РСКІЯ, княжацкі род герба «Друцк», адгалінаванне роду кн. *Друцкіх*. Найб. вядомыя:

Васіль Пуцяціч (каля 1430—да 1495), валодаў маёнткам Горы ў Аршанскім пав. (адсюль 2-я частка прозвішча). Ежы (каля 1600—43), харужы аршанскі (1639), староста упіцкі (1640). Рыгор Ежы (каля 1585—1659), староста цэльскі, аршанскі (1635—50). Атрымаўшы прызначэнне мсціслаўскім ваяводам (1650), перадаў Аршанскае староства сыну Міхаілу. Другі яго сын Еранім быў старостам суражскім. На ўнуках Рыгора Ежы род Д.-Г. згас.

В.Л.Насевіч.

ДРУ́ЦКІЯ-ЛЮБЕ́ЦКІЯ, княжацкі род герба «Друцк», адгалінаванне роду кн. *Друцкіх*. Сыны Васіля Рыгоравіча Друцкага Багдан (каля 1450—да 1500) і Раман (каля 1450—да 1525) набылі маёнтак Любчу на Валыні (адсюль 2-я частка прозвішча). Валодалі таксама часткай *Друцкага княства* з Відунічамі (Відзенічамі), таму некат. прадстаўнікі роду называліся кн. Відуніцкімі. Найб. вядомыя:

Шыман (каля 1665—1710), стольнік оўруцкі (1709), перад смерцю прызначаны мінскім кашталянам. Францішак (каля 1735—1806), суддзя земскі (1765), харужы (1773), маршалак (1782) і кашталян (1793) пінскі. У 1794 заснаваў мураваны касцёл у Луніне. Францішак Ксаверы (1778—1846). Вучыўся ў Пецярбургскім кадэцкім корпусе, удзельнічаў у 1799 у паходзе А.В.Суворава ў Італію і Швейцарыю. Маршалак Гродзенскай губ. (1812). У 1816 часовы гродзенскі губернатар, з 1821 міністр скарбу Царства Польскага. *В.Л.Насевіч.*

ДРУ́ЦКІЯ-САКО́ЛІНСКІЯ, Друцкія-Сакалінскія, княжацкі род герба «Друцк», адгалінаванне роду кн. *Друцкіх*. Найб. вядомыя:

Сямён (?—пасля 1514), намеснік таропецкі (1489), бранскі (1492—94), уладальнік Саколіна каля Друцка (адсюль 2-я частка прозвішча) і інш. Мікалай Мітрафан (каля 1610—90), архімандрыт Браслаўскага базыльянскага манастыра, з 1671 смаленскі уніяцкі архіепіскап. Міхал Леан (каля 1630—90), чашнік (1654) і марша-

лак аршанскі (1665), пісар ВКЛ, староста вяляціцкі (1685). Кароль Міхал (каля 1660—1713), кашталян смаленскі (1703). Міхаіл (каля 1550—1621), маршалак аршанскі (1591), староста азярышчанскі (1597), кашталян віцебскі (1605), ваявода полацкі (1613) і смаленскі (1621). Крыштоф Міхал (каля 1580—1639), староста азярышчанскі (1621—39), кашталян мсціслаўскі (1623), полацкі (1625). Ян Антоні (?—1662), кашталян мсціслаўскі (1655). Леан Лаўрэн (каля 1680—1726), архімандрыт Гродзенскага базыльянскага манастыра (1713), смаленскі уніяцкі архіепіскап (1718).

В.Л.Насевіч.

ДРУЦЬ, рака ў Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абл., правы прыток р. Дняпро. Даўж. 295 км. Пл. вадазбору 5020 км². Пачынаецца за 1 км на З ад в. Раздольная Талачынскага р-на Віцебскай вобл., вусце на паўд. ускраіне г. Рагачоў. Агульная даўж. рачной сістэмы Д. 2000 км. Асн. прытокі: Крывая, Няропля, Вабіч, Арлянка, Балонаўка, Грэза (злева), Аслік, Малыш, Даўжанка, Дабрыца (справа). Вадазбор у вярхоўі ў межань у вярхоўі 10—20 м, ніжэй 30—50 м. Берагі пераважна стромкія, месцамі абрывістыя (выш. да 5 м), у вусцевай ч. спадзістыя (выш. да 1 м). Жыўленне мяшанае: снегавое, дажджавое, грунтавое. Асаблівасць рэжыму — вельмі выразнае веснавое разводдзе, на якое прыпадае 54% гадавога сцёку. Веснавы крыгаход каля 3 сутак. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 31,6 м³/с. Рака прымае сцёк з меліярац. каналаў. Суднаходная ніжэй плацiны Чыгірынскага вадасх. (за 84 км ад вусця) у паўнаводны перыяд. У ніжнім цячэнні каля в. Чыгірынка Чыгірынская ГЭС. На Д. гарады Талачын і Рагачоў, г.п. Круглае і Бялынічы, зоны адпачынку Чыгірынка, Маліна, Друць, Лужкі.

Рака Друць каля г.п. Бялынічы.

ДРУ́ЦЭ Іон Панцялеевіч (н. 3.9.1928, с. Харадыштэ Дандзюшанскага р-на, Малдова), малдаўскі пісьменнік, драматург. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1957). Піша на малд. і рус. мовах. Друкуецца з 1951. Аўтар кніг апавяданняў «У нас на сяле» (1953), «Арэхавы шэпт» (1968), аповесцей «Лісце суму» (1957), «Апошні месяц восені» (1963, аднайм. кінафільм 1966), «Вяртанне на кругі свае» (1972), раманаў «Цяжар нашай дабрыні» (1963—68), «Белая царква» (1982), п'ес «Каса марэ» (1960), «Дойна» (1971), «Птушкі нашай маладосці» (1972), «Святая святых» (1976) і інш., адметных паглыбленым псіхалагізмам, мяккім лірызмам, рамант. прыўзнятасцю, яркім нац. каларытам. Творы Д. на бел. мову перакладалі Я.Брыль, М.Гіль, К.Кірэенка, А.Шарахоўская. У тэатрах Беларусі пастаўлены яго п'есы «Птушкі нашай маладосці» (1972), «Каса марэ» (1976), «Святая святых» (1977), «Імем зямлі і сонца» (1979). Дзярж. прэмія Малдовы 1967.

Тв.: Бел. пер. — Цяжар нашай дабрыні. Мн., 1977.

ДРУ́Я, гарадскі пасёлак у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., пры ўпадзенні р. Друйка ў Зах. Дзвіну. За 36 км ад г. Браслаў, 205 км ад Віцебска. Канцавая ст. на чыг. лініі Варапаева—Друя. Аўтадарогай злучаны з Браславам. 1,4 тыс. ж. (1997).

Упершыню ўпамінаецца ў «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» М.Стрыйкоўскага пад 1386 у складзе ВКЛ. У 14—18 ст. тут існаваў *Друйскі замак*. Паводле адм. рэформы ВКЛ 1565—66 Д. ў Браслаўскім пав. Віленскага ваяв. 8.8.1618 атрымала прывілей на магдэбургскае права і герб: у блакітным полі віціна з разгорнутым ветразем на хвалях, вада сярэбраная. З Д. паходзіць адзін з шэдэўраў бел. рукапіснай кнігі — Друйскае евангелле 16 ст. За час існавання ў Д. пабудавана каля 20 храмаў. У 1790 у Д. 3,4 тыс. ж. З 1793 у складзе Рас. імперыі, мястэчка, заштатны горад Дзісенскага пав. Віленскай губ. У 1897 у Д. 4787 ж. З 1921 у Польшчы, мястэчка ў Браслаўскім пав. Віленскага ваяв. У 1931 у Д. 3375 ж. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 гар. пасёлак у Браслаўскім, з 1.5.1940 да 1963 у Міёрскім р-нах. 2,5 тыс. ж. (1971).

Прадпрыемствы па абслугоўванні чыг. лініі. Сярэдняя і муз. школы, прафес.-тэхн. вучылішча механізацыі меліярац. работ, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, магіла ахвяр фашызму. Помнік на месцы бою 1812. Помнік архітэктуры — *Друйскі кляштар бернардзінцаў* (1643—46) і *Друйскі парк* (19 ст.).

ДРЫ́БІН, гарадскі пасёлак, цэнтр Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл. (з 1989), на р. Проня, на скрыжаванні аўтадарог на Магілёў, Горкі. Цэнтр Міхееўскага с/с і саўгаса. За 22 км на ПдУ ад Горак, 64 км ад Магілёва, 10 км ад чыг. ст. Цёмны Лес. 2580 ж., 1103 двары (1997).

У 16 ст. ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ. Пацярпеў у час Паўн. вайны 1700—21. З 1772 у Рас. імперыі ў Магілёўскай губ. У 1784 цэнтр маёнтка Цеханавецкіх (да 1864), 657 ж., 181 двор, 25 крам, млын, царква. У 1830 заснавана вінакурнае прадпрыемства. У 1845 адбылося выступленне сялян супраць прыгоннага права. У 1880 цэнтр воласці Чавускага пав., 1080 ж., 250 дамоў, 30 крам, царква, валасное праўленне, лячэбніца, 2 млыны, школа, штогод праводзіўся кірмаш. З 1919 у Гомельскай губ., з 1922 у Смаленскай губ. РСФСР. З 1924 у БССР, у 1924—31 і ў 1935—59 цэнтр *Дрыбінскага раёна*, потым у Горацкім р-не, цэнтр сельсавета. У ліп. 1941 акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі, якія стварылі тут лагер смерці, дзе загубілі 2469 чал. У 1943 спалілі 300 двароў, загубілі 380 жыхароў. Пасля вайны вёска адноўлена. У 1971 — 1817 ж., 531 двор. З 1989 зноў цэнтр Дрыбінскага р-на.

Маслазавод. Сярэдняя школа, 2 б-кі, Дом культуры, бальніца, аптэка, паліклініка, аддз. сувязі. Царква, малітоўны дом. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магіла ахвяр фашызму. Каля вёскі 2 стаянкі каменнага веку. Вядзецца буд-ва сац. інфраструктуры раённага цэнтра.

В.М.Князева.

ДРЫ́БІНСКІ РАЁН, на ПнУ Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924, скасоўваўся ў 1931, 1959, зноў утворан ў сучасных межах 29.12.1989 для перасялення жыхароў Краснапольскага р-на, якія найб. пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы 1986. Пл. 0,8 тыс. км². Нас. 16,9 тыс. чал. (1997). Сярэдняя шчыльн. 21 чал. на 1 км². Цэнтр раёна — г.п. *Дрыбін*, 104 сельскія населеныя пункты. Падзяляецца на 6 сель-

межах Аршанскага ўзв., на астатнім працягу — ва ўсх. ч. Цэнтральнабярэзінскай раўніны.

Даліна да ўпадзення р. Крывая невыразная, ніжэй трапецападобная шыр. 1,5—2,5 км. Схілы парэзаныя, выш. 8—30 м, да г.п. Бялынічы адкрытыя і пад ворывам, ніжэй па цячэнні пераважна пад лесам. Левы схіл больш спадзісты, правы сярэдне стромкі, нярэдка абрывісты. Пойма ў асноўным двухбаковая (на асобных участках у нізоўі левабярэжная, у верхнім цячэнні часткова затопленая Цяцерынскім, у ніжнім Чыгірынскім вадасх.), адкрытая, лугавая. Паверхня поймы ў прырэчышчавай ч. роўная, месцамі ўзгорыстая, перасечаная старыцамі, асушальнымі канавамі, лагчынамі. Рэчышча каналізаванае на 2 участках у вярхоўі агульнай працягласцю каля 16 км, на астатнім працягу моцназвілістае, свабодна меандруе, ніжэй упадзення р. Вабіч разгалінаванае на пратокі і рукавы са шматлікімі старыцамі і залівамі. Шыр. ракі ў

саветаў: Кароўчынскі, Міхееўскі, Першамайскі, Расненскі, Цемналескі, Чэрнеўскі.

Тэрыторыя раёна ў межах *Аршанска-Магілёўскай раўніны*. Паверхня раўнінная, месцамі хвалістая, з агульным нахілам на Пд. Найвыш. пункт 226 м (на ПдЗ ад в. Еськаўка). Пераважаюць выш. 170—190 м. Карысныя выкапні: пясок, гравій, торф, гліна для грубай керамікі. Сярэдняя т-ра студз. -8 °С, ліп. 18 °С. Ападкаў 620 мм. Вегетац. перыяд 184 сут. З Пн на Пд працякае р. Проня з прытокамі Рэста, Бася, Быстрая, Вербаўка і інш. На некат. малых рэках вадасховішчы і сажалкі. Пашыраны дзярнова-падзолістыя і дзярнова-палева-падзолістыя глебы. Пад лесам 27,4% тэр. раёна; пераважаюць шыракалістаяловыя лясы. Балоты і забалочаныя землі займаюць каля 1,5 тыс. га у асноўным на Пн. На тэр. раёна гідралагічныя заказнікі: Брацтва (73,1 га), Галамукскае (153), Жэваньскае (144), Жэваньскі Мох (123); паляўнічыя заказнікі: Расненскае (2650), Даманоўскі (1364 га).

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 49,1 тыс. га, з іх асушана 5 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 7 калгасаў, 4 саўгасы, 20 фермерскіх гаспадарак, кормапрадпрыемства «Высакаборскае». Асн. галіна сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля; вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу. Прадпрыемствы харч. прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Орша—



Крычаў, аўтадарога Магілёў—Мсціслаў, нафтаправод Унеча—Полацк. У раёне 8 сярэдніх, 2 базавыя, 4 пачатковыя школы; Расненская дапаможная школа-інтэрнат, муз. школа, 9 дашкольных устаноў, 14 б-к, 14 клубаў, 3 клубы-бібліятэкі, раённы цэнтр культуры, 4 бальніцы, 9 фельч.-ак. пунктаў. Помнікі архітэктуры: Пакроўская царква (1845), помнік у памяць аб выступленні ў 1905 сялян супраць памешчыка ў в. Кішчыцы; рэшткі касцёла Казіміра эпохі класіцызму (1818) і сядзіба (канец 19 ст.) у в. Расна. Гісторыка-этнаграфічны музей. Выдаецца газ. «Ленінскі шлях» (сумесна з Горацкім р-нам). *Г.С.Смалякоў.*

ДРЫВАСЕ́КІ, насякомыя, гл. *Вусачы*.

ДРЫВО́ЦІНАЎ Барыс Уладзіміравіч (н. 14.3.1922, г. Вольск Саратаўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне неўралогіі. Д-р мед. н. (1973), праф. (1976). Ганаровы акад. Бел. акадэміі мед. навук (1997). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1950) і працуе ў ім. Навук. працы па хваробах перыферычнай нерв. сістэмы, астэахандрозе пазваночніка, рэўматызме мозга ў дзяцей, выкарыстанні выліч. метадаў і аўтаматызаваных сістэм для ранняй дыягностыкі, прагназавання неўралагічных праяў астэахандрозу пазваночніка і інш. хвароб нервовай сістэмы. Дзярж. прэмія Беларусі 1994.

Тв.: Неврологические нарушения при поясничном остеохондрозе. Мн., 1979; Прогнозирование и диагностика дискогенного поясничнo-крестцового радикулита. Мн., 1982 (разам з Я.А.Луп'янам); Поражение нервной системы при эндокринных болезнях. Мн., 1989 (разам з М.З.Клябанавым).

Літ.: Б.В.Дривотинов: (к 75-летию со дня рождения) // Здравоохранение. 1997. № 4.

ДРЫВЯ́ТЫ, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка (выцякае з возера), каля паўд. ускраіны г. Браслаў. Уваходзіць у *Браслаўскую групу азёр*. Пл. 36,1 км², даўж. 9,9 км, найб. шыр. 4,5 км, найб. глыб. 12 м, даўж. берагавой лініі 37,6 км. Пл. вадазбору 459 км². Схілы катлавіны пераважна пад лесам, асіметрычныя: на Пн выш. 30—37 м, месцамі разараныя, на Пд да 5 м, забалочаныя. На Пд і ПдУ 3 вял. залівы. Дно да глыб. 3,5—5 м выслана пяскамі, ніжэй глеямі і сапрапелямі. 6 астравоў агульнай пл. 0,92 км². Шыр. паласы расліннасці да 200 м. Трапляюцца рэдкія для флоры Беларусі віды раслін: наяды гнуткая і малая, гідрыла кальчаковая; адзначана гнездаванне лебедзя-шыпуна, які занесены ў Чырв. кнігу. У возера ўпадаюць рэчкі Усвіца (злучае з воз. Іказнь), Золвіца, Акунёўка, Рака (злучае з воз. Рака), 6 ручаёў. Уваходзіць у зону адпачынку Браслаў, на паўн. беразе турбаза «Браслаўскія азёры».

ДРЫГАВІ́ЧЫ, адно з племянных аб'яднанняў усх. славян, вядомых па пісьмовых крыніцах і археал. помніках. Займалі тэр. на У да Дняпра, на Пн да лініі Барысаў—Лагойск—Заслаўе—вярхоўе Нёмана; на Пд мяжа пераходзіла за Прыпяць, на З — за Зах. Буг (паводле інш. даных да Выганашчанскага балота, на Пн ад Пінска). У 6—8 ст. папярэднікамі Д. на сярэдняй Прыпяці былі славянскія плямёны *пражскай культуры*. На Пн ад Прыпяці ў гэты час жылі балцкія плямёны (гл. *Балты*). На тэр. рассялення Д. захаваліся археал. помнікі: гарадзішчы, селішчы, курганныя могільнікі з пахавальным абрадам трупаспалення, з 10 ст. — могільнікі з пахавальным абрадам трупапалажэння на гарызонце або падкурганнай яме. Зрэдку ў курганах трапляюцца збудаванні ў выглядзе невысокага драўлянага зруба, накрытага дахам. Пахавальны інвентар: гліняныя гаршкі, спражкі, крэсівы, сякеры, наканечнікі коп'яў і інш.; у жаночых пахаваннях пераважаюць упрыгожанні: шкляныя каляровыя разнастайныя па памерах і форме пацеркі, бронзавыя скроневыя кольцы з заходзячымі канцамі, пярсцёнкі, бранзалеты і інш. Характэрныя племянныя адзнакі — вял. медныя або сярэбраныя пацеркі, аздобленыя зерню, і скроневыя кольцы-завушніцы з круглага дроту, на якіх замацаваны па 3 металічныя пацеркі невял. памераў.

Упершыню Д. названы ў «Аповесці мінулых часоў» у сувязі з падзеямі, якія папярэднічаюць 9 ст. У 10 ст. (948) іх упамінае візантыйскі гісторык Канстанцін Багранародны, у 12 ст. (1149) стараж.-рус. летапісы. Д. належалі да найб. развітых у сац. адносінах плямён, знаходзіліся на заключнай стадыі распаду родаплемяннога ладу, мелі сваё паліт. аб'яднанне — «княжанне». Займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, агародніцтвам, былі развіты промыслы і гандаль. Найб. гарады: Тураў, Пінск, Давыд-Гарадок, Брэст, Мінск, Мазыр, Клецк, Слуцк, Капыль, Рагачоў, Камянец, Кобрын. У 10 ст. землі Д. увайшлі ў склад *Кіеўскай Русі*, з канца 10 ст. на іх землях узнікла *Тураўскае княства*, у канцы 12 ст. з яго вылучыліся ўдзельныя *Пінскае княства*, Клецкае, Дубровіцкае, верагодна, *Нясвіжскае княства*. Частка паўн.-ўсх. зямель Д. увайшла ў *Полацкае княства*, а паўд.-ўсх. — у *Кіеўскае княства*. *П.Ф.Лысенка.*

ДРЫГВА́, тое, што *багна*.

ДРЫЖА́ЛКА (Tremella), род гетэрабазідыяльных грыбоў сям. дрыжалкавых. Вядома каля 100 відаў. Пашыраны пераважна ў трапічных і субтрапічных зонах. Сапратрофы. На Беларусі 3 віды.

Дрыжалка звілістая.

Найчасцей трапляецца на сухіх галінках лісцевых дрэў на працягу ўсяго года Д. звілістая (T. mesenterica).

Пладовыя целы акруглыя, пукатыя, з глыбокімі звілістымі складкамі, ярка жоўтыя ці аранжавыя, дыям. да 4 см, шчыльнастудзяністыя, пры высыханні рогападобныя. Споры яйцападобныя, гладкія, бясколерныя.

ДРЫЖА́ЛКАВЫЯ (Tremellales), парадак гетэрабазідыяльных грыбоў. Вядома каля 200 відаў. Пашыраны пераважна ў трапічных і субтрапічных зонах. На Беларусі 10 відаў з родаў *дрыжалка*, эксідыя, трэмеладон. Сапратрофы. Трапляюцца на ўсёй тэрыторыі на старых пнях, ламачча.

ДРЫ́ЖНІК (Briza), род кветкавых раслін сям. метлюжковых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Пярэдняй Азіі, Паўн. і Паўд. Афрыцы, асабліва ў Міжземнамор'і. На Беларусі паўсюдна на лугах, лясных палянах і ўзлесках трапляецца Д. сярэдні (B. media). Як інтрадукаваная дэкар. расліна вырошчваецца і зрэдку дзічэе Д. вялікі (B. maxima).

Шмат- ці аднагадовыя травяністыя расліны з кароткімі паўзучымі падземнымі парасткамі або без іх. Сцябло прамастойнае, простае або

Аўтар карты П.Ф.Лысенка

ад асновы галінастае. Лісце сядзячае, лінейнае, пляскатае, шыр. 2—8 мм. Кветкі сабраны ў спляскатыя рамбічныя ці яйцападобныя каласкі, якія ўтвараюць агульнае раскідзістае або сціснутае мяцёлчатае суквецце. Плод — зярняўка. Кармавыя, дэкар. (выкарыстоўваюць для групавых пасадак і на сухія букеты) і лек. (мачагонны, сардэчны, супрацьзапаленчы сродак) расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДРЫЗІ́НА (ням. Draisine), транспартная машына на рэйкавым колавым ходу для перавозкі людзей і грузаў на невял. адлегласці. Прыводзіцца ў рух ад аўтамабільнага (*аўтадрызіна*) або матацыклетнага (мотадрызіна) рухавіка ўнутр. згарання. Першыя Д. — 4-колавыя цялежкі з ручным прыводам. Вынайдзена ням. вынаходнікам К.Ф.Дрэзам (1785—1851; адсюль назва).



Дрызіна: 1 — пасажырская; 2 — грузавая.

ДРЫЛЬ (ад ням. drillen свідраваць), ручны інструмент або машына для свідравання і апрацоўкі адтулін у метале, дрэве, пластмасе і інш. Бываюць эл., пнеўматычныя (ратацыйныя, з пнеўматычным лопасцевым рухавіком) і ручныя. Электрадрыль складаецца з эл. рухавіка, зубчастай перадачы і патрона для свердла. Скорасць вярчэння да 2200 аб/мін і болей. З рознымі прыстасаваннямі можа выкарыстоўвацца для фрэзе-



Дрыль электрычны: 1 — электрарухавік; 2 — махавік; 3 — патрон; 4 — валік; 5 — зубчастая перадача; 6 — курконы пераключальнік.

Дрыжнік сярэдні.

равання, шліфавання, паліравання і інш.

ДРЫН (Drini), рака ў Албаніі (вытокі ў Македоніі і Югаславіі). Утвараецца з сутокаў Чорнага і Белага Д. Даўж. 148 км, разам з Чорным Д. 281 км, пл. бас. 12,6 тыс. км^2. Асн. вытак (Чорны Д.) пачынаецца ў Ахрыдскім воз., Белы Д. — у Паўн.-Албанскіх Альпах. Цячэ пераважна ў адгор'ях Паўн.-Албанскіх Альпаў, у нізоўі, на прыморскай нізіне, падзяляецца на 2 рукавы. Паўд. рукаў упадае ў Дрынскі зал. Адрыятычнага м., паўн. — у р. Буна. Сярэдні расход вады 290 м^3/с. Суднаходная ў нізоўі. Выкарыстоўваецца для арашэння. На Д. горад Кукес (Албанія).

ДРЫ́НА (Drina), рака ў Югаславіі, Босніі і Герцагавіне, правы прыток р. Сава (бас. Дуная). Утвараецца ад сутокаў рэк Тара і Піва, якія пачынаюцца ў Чарнагорыі. Даўж. 460 км, пл. бас. 19,6 тыс. км^2. Цячэ па Дзінарскім нагор'і ў вузкай, глыбокай даліне, утварае парогі і вадаспады, у нізоўі па Сярэднедунайскай раўніне. Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні 341 м^3/с. Веснавое разводдзе, асенне-зімовыя паводкі. ГЭС. Выкарыстоўваецца для арашэння.

ДРЫ́НАЎ Марын Стаянаў (20.10.1838, г. Панагюрыштэ, Балгарыя — 13.3.1906), балгарскі і рускі гісторык-славіст. Чл.-кар. Пецярб. АН (1898). Скончыў Маск. ун-т (1865). Адзін з заснавальнікаў (1869) і першы старшыня Балгарскага т-ва прыхільнікаў ведаў (з 1911 Балгарская АН). З 1873 праф. Харкаўскага ун-та. Уваходзіў у Часовае рус. кіраванне ў Балгарыі пасля рус.-турэцкай вайны 1877—78. У 1878—79 заг. аддзела нар. адукацыі і духоўных спраў. Працы па стараж. гісторыі славян.

ДРЫНЁЎСКІ Міхаіл Паўлавіч (н. 12.2.1942, в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. харавы дырыжор. Засл. дз. маст. Беларусі (1978). Нар. арт. Беларусі (1987). Скончыў Бел. кансерваторыю (1968, клас Г.*Зелянкавай*). З 1968 хормайстар, з 1975 маст. кіраўнік — гал. дырыжор *Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь* імя Г.І.Цітовіча. З 1968 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі. Для яго творчасці характэрны глыбокае веданне бел. муз. фальклору, аднолькавая ступень пранікнення ў заканамернасці акад. і нар. спявання. Асаблівай інтанацыйнай тонкасцю вылучаюцца падрыхтаваныя ім канцэртныя праграмы хар. музыкі, маляўнічыя і шматадценкавыя этнагр. праграмы, творы духоўнай музыкі. Аўтар шматлікіх запісаў нар. мелодый і шэрагу іх апрацовак для нар. хору («Ой, ты, грушка мая», «Вол бушуе, вясну чуе», «Як пайду я дарогаю», «Ночы мае, ночушкі», «Чырвоная каліначка» і інш.). Зрабіў значны ўклад у развіццё самадз. хар. мастацтва Беларусі, шмат працаваў з самадз. хар. калектывамі акад. плана. Дзярж. прэмія Беларусі 1982. *З.Я.Мажэйка.*

М.П.Дрынеўскі.

С.Р.Дрынь.

ДРЫНЬ Савелій Рыгоравіч (4.1.1912, в. Таўбозіна Бранскай вобл., Расія — 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Радавы Д. вызначыўся пры вызваленні Гомельскай вобл.: 25.6.1944 у баі за в. Святое Возера Рагачоўскага р-на разам са ст. лейтэнантам В.С.Уткіным з гранатамі кінуўся пад самаходную гармату «фердынанд»; цаной свайго жыцця воіны сарвалі контратаку праціўніка.

ДРЫ́СА, рака ў Расонскім і Верхнядзвінскім р-нах Віцебскай вобл., правы прыток р. Зах. Дзвіна. Даўж. 183 км. Пл. вадазбору 6420 км^2. Выцякае з воз. Дрысы, цячэ на паўн. ч. Полацкай нізіны, праз азёры Астраўцы, Сіньша і Буза, вусце ў межах г. Верхнядзвінск. Асн. прытокі: Нешчарда, Нішча, Свольна (справа), Шчаперня і Дахнарка (злева). Даліна трапецападобная, месцамі скрынкападобная, ніжэй вусця р. Нішча на асобных участках невыразная, шыр. 200—500 м, у нізоўі — 1,5 км. Пойма нярэдка забалочаная, шыр. 100—500 м. Рэчышча звілістае, шыр. 25—45 м. Веснавое разводдзе пачынаецца ў канцы сак., доўжыцца каля 60 сут. Летне-асенняя межань каля 140 сут. Замярзае ў канцы снеж., крыгалом у канцы сак.—пач. красавіка. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 45,6 м^3/с. На рацэ г. Верхнядзвінск.

ДРЫ́СА, назва да 25.12.1962 г. *Верхнядзвінск.*

ДРЫСВЯ́ТА, Друкша, рака ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Дзісна (бас. р. Зах. Дзвіна). Даўж. 44 км. Пл. вадазбору 1020 км^2.

Рака **Дрыса** каля вёскі Вальянцы Верхнядзвінскага раёна.

Пачынаецца каля в. Грытуны (да пабудовы ГЭС «Дружба народаў» у 1953 рака выцякала з воз. Дрысвяты). Цячэ праз азёры Доўгае, Верхняе і Богінскае. Участак б. рэчышча паміж вёскамі Ёдзішкі і Вусце цяпер лічыцца прытокам Д. — Дрысвяткай. Верхняе цячэнне ракі ў межах Браслаўскай градыі, ніжняе — на З Полацкай нізіны. Асн. прыток — р. Прорва (злева). На вадазборы 139 азёр. Даліна пераважна трапецападобная. Пойма перарывістая. Рэчышча сярэдне звілістае, на працягу каля 9 км каналізаванае.

ДРЫСВЯ́ТЫ, археалагічныя помнікі (гарадзішча 2—1 ст. да н.э., эпохі Кіеўскай Русі, ВКЛ і селішча 11—13 ст.) на зах. частцы востраваЗамак на воз. Дрысвяты Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. На гарадзішчы выяўлены фрагменты ляпной керамікі, сляды агнішчаў, рэшткі каменных сякер *днепра-дзвінскай культуры*, рэшткі пабудоў 10—13 ст., прадметы побыту, жаночыя ўпрыгожанні, прылады працы 11—16 ст., манеты 16 ст. На селішчы знойдзена шмат вырабаў з жалеза, бронзы, косці і рогу.

Заліў возера Дрысвяты.

ДРЫСВЯ́ТЫ (літ. Друкшай, Drūkšiai), возера на мяжы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. і Літвы, у бас. р. Дрысвята, за 22 км на З ад г. Браслаў. Пл. 44,5 км^2, даўж. 13 км, найб. шыр. 5,8 км, найб. глыб. 31 м, даўж. берагавой лініі больш за 60 км. Пл. вадазбору 604 км^2. Схілы катлавіны — узгоркі і градывыш. да 15 м, месцамі спадзістыя, забалочаныя, усх. і паўд.-ўсх. разараныя, астатнія аблесеныя. Звілістая берагавая лінія ўтварае мноства заліваў, асабліва ў паўд. частцы. На берагах шмат валуноў. Рэльеф дна ўзгорысты; да глыб. 5 м пясчаныя грунты, цэнтр. ч. выслана глеямі, 8 астравоў, найб. з іх Замак (пл. 0,26 км^2). Зарастае каля 10% пл. возера. Упадаюць рэкі Апівардка, Рычанка, выцякае р. Прорва. На беразе возера Дрысвяцкі парк. Выкарыстоўваецца як вадаём — ахаладжальнік Ігналінскай АЭС.

ДРЫСВЯ́ТЫ, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., каля воз. Дрысвяты, на аўтадарозе Відзы—Даўгаўпілс. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 35 км на З ад Браслава, 255 км ад Віцебска, 65 км ад чыг. ст. Друя. 367 ж., 137 двароў (1997).

Упершыню ўпамінаюцца ў дакументах 15 ст. У розны час належалі Радзівілам, Сапегам, Агінскім, Лапацінскім і інш. У 14—17 ст. на востраве воз. Дрысвяты існаваў *Дрысвяцкі замак*. Пасля адм. рэформы ВКЛ 1565—66 у Браслаўскім пав. Віленскага ваяв. Паводле інвентара за 1722, у Д. каля 400 ж., 52 дымы, 25 корчмаў, каспёл, плябанія, царква. У канцы 19 ст. ў мястэчку Д. 205 ж. З 1921 у Польшчы, цэнтр гміны Браслаўскага пав. Віленскага ваяв. 74 дамы, 375 ж. (1931). З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета Відзаўскага р-на. З 1960 у Браслаўскім р-не. 99 двароў, 275 ж. (1971).

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнікі архітэктуры — *Дрысвяцкая царква* (1908) і *Дрысвяцкі Петрапаўлаўскі касцёл* (1929). На востраве воз. Дрысвяты археал. помнікі *Дрысвяты*.

ДРЫСВЯ́ЦКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рус. стылю. Пабудавана ў 1908 у в. Дрысвяты (Браслаўскі р-н Віцебскай вобл.). У плане падоўжаная па восі ўсход—захад 4-часткавая кампазіцыя: званіца, трапезная, 5-купальны асн. аб'ём, 5-гранная апсіда. Ступеньчатая форма званіцы з паўкруглымі закамарамі, якімі завяршаецца верхні ярус, філёнгавыя пілястры асн. аб'ёму, актыўна прафіляваныя карнізы ствараюць цікавы арх. вобраз.

ДРЫСВЯ́ЦКІ ЗА́МАК. Існаваў у 14—17 ст. на в-ве Замак на воз. Дрысвяты ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пабудаваны на гарадзішчы днепра-дзвінскай культуры і перыяду Кіеўскай Русі 10—13 ст. Пляцоўка замка (75 × 50 м) мела авальную форму, узвышалася над паверхняй возера на 6—7 м, была абкружана валам. У канцы 14 — пач. 15 ст. на востраве стаяў «двор Дрысвяты» вял. кн. ВКЛ Вітаўта, пазней — караля Аляксандра. У пісьмовых крыніцах замак згадваецца ў 1514, 1557, 1561 і ў часы Лівонскай вайны 1558—83. Перастаў існаваць у 2-й пал. 17 ст.

ДРЫСВЯ́ЦКІ ПЕТРАПА́ЎЛАЎСКІ КАСЦЁЛ, помнік драўлянага дойлідства. Пабудаваны ў 1929 у в. Дрысвяты Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. (арх. Л.Вітан-Дубейкаўскі). Мае рысы стылю мадэрн.

Прамавугольны ў плане будынак з 5-гранай алтарнай апсідай, бабінцам і сакрысціямі

Дрысвяцкая царква.

Дрысвяцкі Петрапаўлаўскі касцёл.

накрыты дахам складанай формы. Гал. фасад вылучаны высокай 5-яруснай вежай-званіцай, уваход аформлены падчэнямі на 4 мураваных слупах. Сцены ашаляваны дошкамі, вокны арачныя і круглыя. Інтэр'ер падзелены 8 слупамі на 3 нефы. Столь касеніраваная, з арнаментальнай размалёўкай. Над бабінцам — хоры.

ДРЫ́СЕНСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1942, аперацыя партыз. брыгады «За Савецкую Беларусь» (камандзір А.І.Петракоў) па падрыве 110-метровага чыг. моста цераз р. Дрыса на лініі Даўгаўпілс—Полацк у Дрысенскім р-не Віцебскай вобл. ў Вял. Айч. вайну, праведзеная 4 жніўня. Мост ахоўваў фаш. гарнізон (70 чал.), падыходы былі замініраваны, абнесены агароджай з калючага дроту. У ходзе аперацыі ўдарная група з 3 партыз. атрадаў пад кіраўніцтвам П.М.*Машэрава* знішчыла ахову моста; група падрыўнікоў на чале з П.Р.Мандрыкіным узарвала мост. У выніку аперацыі рух на магістралі быў спынены на 16 сутак, прапускная здольнасць дарогі зменшылася з 60 да 8 эшалонаў за суткі.

ДРЫ́СЕНСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка на тэр. Беларусі ў 18—20 ст. Утвораны 4.9.1776 у *Полацкай губерні* пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай. 23.12.1796 скасаваны, яго тэр. перададзена *Беларускай губерні*. 11.3.1802 адноўлены ў складзе *Віцебскай губерні*. Цэнтр — г. Дрыса. Пл. 2568, 9 кв. вёрст, нас. 97 083 чал. (1897). Уключаў 17 валасцей: Асвейскую, Дзёрнавіцкую, Замашанскую, Зябкаўскую, Ігналінскую, Каменскую, Каханавіцкую, Клясціцкую, Прыдруйскую, Пустынскую, Сар'янскую, Стрыжанскую, Сушкоўскую, Таболкаўскую, Філіпаўскую, Юстыянаўскую і Юхавіцкую; 7 мястэчак, 811 паселішчаў сельскага тыпу. У студз. 1919 Клясціцкая вол. перададзена ў *Полацкі павет*. Паводле мірнага дагавора Расіі з Латвіяй ад 11.8.1920 Прыдруйская і Пустынская вол. ўвайшлі ў склад Латвіі. Скасаваны



15.2.1923, яго тэр. ўключана ў Полацкі пав.

ДРЫ́СЫ, возера ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрыса (выцякае з возера), за 35 км на У ад г.п. Расоны. Пл. 2,26 км^2, даўж. 3,7 км, найб. шыр. 960 м, найб. глыб. 3,7 м, даўж. берагавой лініі больш за 11 км. Пл. вадазбору 1578 км^2. Схілы катлавіны выш. 5—10 м (на З 15—20 м), параслі мяшаным лесам. Берагі пад хмызняком і лесам. Дно плоскае. У цэнтры 5 астравоў агульнай пл. 1 га. Мелкаводдзе ўздоўж берагоў і вакол астравоў да глыб. 2 м пясчанае і глеістае. На Пд упадае р. Ушча, на ПнЗ злучана пратокай з воз. Глыба.

ДРЫЦ Веньямін Уладзіміравіч (н. 27.5.1955, в. Яблачына Барысаўскага р-на Мінскай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1992). Скончыў БДУ (1976). З 1976 у Ін-це матэматыкі АН Беларусі. Навук. працы па выліч. матэматыцы і матэм. мадэляванні. Распрацаваў метады пабудовы эфектыўных і эканамічных выліч. алгарытмаў для рашэння задач нелінейнай оптыкі.

Тв.: Консервативные разностные схемы в задачах нелинейной оптики. Ч. 1—2 // Дифференциальные уравнения. 1991. Т. 27, № 7; 1992. Т. 28, № 7.

ДРЫ́ЧЫН, вёска ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл., на правым беразе р. Пціч, на аўтадарозе Асіповічы — в. Шышчыцы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 33 км на ПдЗ ад Асіповіч, 194 км ад Магілёва, 12 км ад чыг. ст. Фалічы. 285 ж., 110 двароў (1997). Сярэдняя школа, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ДРЫ́ЧЫН, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 15 км на ПнЗ ад Мар'інай Горкі, 48 км ад Мінска, 2 км ад чыг. ст. Дрычын. 720 ж., 256 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, лазнева-пральны камбінат, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. ваеннапалонных і партызан.

ДРЫ́ЯДА, курапатчына трава (Dryas), род кветкавых раслін сям. ружавых. Больш за 10 відаў. Пашыраны ў арктычных і субарктычных раёнах, таксама ў высакагор'ях на Пн умеранага пояса. Расце ў тундры, на гальцы і альпійскіх лугах. Найб. вядомыя Д. васьміпялёсткавая (D. octopetala) і кропкавая (D. punctata).

Дрыяда васьміпялёсткавая.

Шматгадовазялёныя кусцікі са сцелістым сцяблом. Лісце простае, скурыстае, зверху зялёнае, бліскучае, знізу бела-лямцавае. Кветкі адзіночныя, буйныя, белыя, рэдка жоўтыя, на прамастойных кветаносах. Плод — шматарэшак. На каранях развіваецца эктатрофная *мікарыза*. Кармавыя (для аленяў), харч. (сурагат гарбаты), лек. (вяжучае) і дэкар. (выкарыстоўваюцца для стварэння альпінарыяў) расліны.

Г.У.Вынаеў.

ДРЫЯ́ДЫ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі *німфы* дрэў, якія жывуць у лясах і гаях, дочкі *Зеўса* і дрэў. Жылі і паміралі разам з дрэвамі, апекавалі ўсіх, хто саджаў і даглядаў дрэвы.

ДРЭ́ВА, шматгадовая расліна з выразным, у рознай ступені адраўнелым гал. сцяблом (ствалом), кронай і разгалінаванай каранёвай сістэмай; пашараная жыццёвая форма раслін. Адыгрывае гал. ролю ў стварэнні лясных біяцэнозаў. На Беларусі 26 відаў Д. Сярод іх лесаўтваральныя (*асіна, бяроза, вольха, граб, дуб, елка, хвоя*) і пладовыя (*вішня, груша, слівa, яблыня*) пароды. Ёсць *дрэвы-помнікі*. Шэраг Д. інтрадукаваныя (лістоўніца сібірская і еўрапейская, хвоі Банкса, Мурэя, веймутава і інш.).

Д. ўзніклі ў сярэднім дэвоне. Належаць пераважна да хвойных (з голанасенных) і двухдольных (з пакрытанасенных) раслін. Крона ў большасці Д. складаецца з галін і лісця. Ствол захоўваецца на працягу ўсяго жыцця, кожны год дае прырост у таўшчыню, утвараючы *гадавыя кольцы*. У Д. з класа аднадольных (напр., пальмаў) крона складаецца з разеткі вял. лісця і адсутнічае другасны прырост у таўшчыню. Ёсць Д. летне-зялёныя (скідваюць лісце з надыходам восені, напр., дуб, вольха) і вечназялёныя (напр., елка, піхта, хвоя). Сярод лісцевых Д. вылучаюць шыракалістыя (дуб, клён, ясень) і драбналістыя (асіна, бяроза, вольха). Адрозніваюць Д. першай велічыні (20 м і больш; дуб, елка, ліпа, хвоя), другой (10—20 м; вольха, груша, рабіна) і трэцяй (5—10 м; глог, яблыня, ядловец). Працягласць жыцця разнастайная, ад 20 да соцень і тысяч гадоў (баабаб, секвоя — да 3—5 тыс. гадоў, дуб — 500—1000, хвоя — 300—350, елка — 250—300, асіна, бяроза — 150—200 гадоў). Д. — адны з асн. прадуцэнтаў кіслароду паветра, даюць драўніну, ядомыя плады, лек., тэхн. і хім. сыравіну; выкарыстоўваюцца для азелянення.

Выкарыстоўваецца са стараж. часоў у архітэктуры (гл. *Драўлянае дойлідства*), дэкар.-прыкладным і нар. мастацтве, скульптуры. На Беларусі з Д. здаўна вырабляюць хатняе начынне, прылады працы, трансп. сродкі, мэблю і інш. Шырока выкарыстоўвалася Д. ў пернікарстве, набіванцы, іканастасах, абкладах абразоў і інш. Асн. матэрыял *дрэварыту*. Разьбой па Д. ўпрыгожваюць ліштвы, франтоны, вільчакі, вуглавыя накладкі. Багацце колеравых адценняў, разнастайнасць фактуры і тэкстуры вызначаюць мноства дэкар. эфектаў у вырабах з Д.

«ДРЭ́ВА ЖЫЦЦЯ» (франц. l'arbe de vie), неафіцыйная назва аднаго з відаў

раслін роду *туя*. Так названа ў пач. 16 ст. каралём Францыі амер. расліна туя заходняя (Thuja occidentalis). Лічыцца таксама, што «Д.ж.»— пераклад нар. назвы азіяцкага віду туі, магчыма, туі ўсходняй (Th. orientalis), — адзінага віду падроду платыкладус, які некат. сістэматыкі вылучаюць у асобны род Biota.

Шматтадоваязялёныя дрэвы або кусты з мяккай, але ўстойлівай да гніення драўнінай і шчыльным лускападобным лісцем. Як дэкар. расліны традыцыйна выкарыстоўваюцца на могілках і мемар. комплексах.

ДРЭ́ВА ЖЫЦЦЯ́ ў міфалогіі, гл. ў арт. *Сусветнае дрэва.*

Розныя формы **дрэў**: 1 — хвоя звычайная; 2 — елка звычайная; 3 — кедр ліванскі; 4 — бяроза; 5 — вольха; 6 — вярба; 7 — вашынгтонія; 8 — баньян.

«ДРЭ́ВА ПАДАРО́ЖНІКАЎ», неафіцыйная назва равеналы мадагаскарскай (Ravenala madagascariensis) сям. бананавых. Эндэмік а-воў Мадагаскар і Рэюньён.

Да арт. **«Дрэва жыцця»**. Туя ўсходняя.

«Дрэва падарожнікаў».

Дрэвападобная травяністая расліна з прамастойным сцяблом выш. да 10 м. Лісце буйное, простае, ад ветру разрываецца на долі да сярэдняй жылкі, размешчана веерападобна. У доўгіх пазухах лістоў назапашваецца вада, якая часам выкарыстоўваецца падарожнікамі для пітця (адсюль назва). Кветкі сабраны ў коласападобныя суквецці. Плод — ягадападобны, накшталт банана, формаю нагадвае агурок. *Г.У.Вынаеў.*

ДРЭ́ВА ПАЗНА́ННЯ ў міфалогіі, гл. ў арт. *Сусветнае дрэва.*

ДРЭ́ВА СУСВЕ́ТНАЕ, гл. *Сусветнае дрэва.*

ДРЭВААПРАЦО́ЎКА, гл. *Апрацоўка драўніны.*

ДРЭВААПРАЦО́ЎЧАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна прамысловасці па мех. і хім.-мех. апрацоўцы драўніны. Уключае 3 гал. групы вытв-сці: лесапільную; клееных матэрыялаў і пліт; вырабаў з драўніны. Асн. сыравінай для лесапільнай вытворчасці служаць бярвёны; асн. прадукцыя — піламатэрыялы, дадатковая — тэхнал. трэскі, якія атрымліваюць здрабненнем кавалкавых адходаў. Асн. сыравінай клееных матэрыялаў і пліт служаць лясныя сартыменты, драўнінныя адходы і кляі; прадукцыя — клееныя паўфабрыкаты і вырабы (фанера, фанерныя пліты, клееныя буд. канструкцыі, драўнянаслаістыя пластыкі, драўнянастружкавыя і драўнянавалакністыя пліты і інш.). Для вырабаў з драўніны зыходная сыравіна — драўніна і драўнінныя матэрыялы, пластмасы, металы, шкло, тканіны, кляі, лакі і інш.; прадукцыя — сталярна-буд. вырабы, драўняныя дамы, мэбля, муз. інструменты, тара, спарт. інвентар, гасп. тавары, сувеніры, абсталяванне сродкаў транспарту і інш.

У Рас. імперыі Д.п. узнікла ў саматужнай і рамесніцкай форме ў пач. 18 ст. Інтэнсіўна развіваецца з 2-й пал. 19 ст. Удз. в. Беларусі ў агульным аб'ёме Д.п. Расіі ў 1913 складала 6,5%. Пераважала лесапілаванне (59,1% валавой прадукцыі). Лясная сыравіна і паўфабрыкаты ішлі ў асноўным за мяжу. Працавалі: Бабруйскі, Гомельскі і Мазырскі лесапільныя з-ды, запалкавыя і фанерныя прадпрыемствы ў Пінску, Барысаве, Гомелі і інш.

У СССР развіццё Д.п. было звязана з ростам капітальнага буд-ва, машынабудавання, вытв-сці тавараў шырокага ўжытку. У 1920—30-я г. працавалі: дрэваапр. з-д у Мінску, Гомельскія лесакамбінат (на базе лесапільных з-даў) і дрэваапр. камбінат, Бабруйскі лесакамбінат і *Бабруйскі фанерна-дрэваапрацоўчы камбінат*, Віцебскі фанерны з-д і інш. Да Айч. вайны ў Беларусі былі 3 дрэваапр. камбінаты, 26 леса- і 16 фанерных з-даў, 5 мэблевых, 4 запалкавыя ф-кі. Аб'ём выпуску прадукцыі ў 1940 больш як у 6,5 раза перавышаў узровень 1913. Выпуск клеенай фанеры склаў 34,8%, запалак — 28,6% агульнасаюзнага аб'ёму. Пасля вайны побач з адноўленымі пабудаваны новыя прадпрыемствы Д.п. Маючы 0,7% лясоў СССР, у канцы 1980-х г. Беларусь выпускала 10,6% фанеры, каля 8% драўнянавалакністых і 7% драўнянастружкавых пліт, 6% мэблі, 3,4% паперы ад усесаюзнага аб'ёму.

Найбольшымі і тэхнічна развітымі прадпрыемствамі з'яўляюцца *Бабруй-*

ская мэблевая фабрыка, Гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат, Мазырскі дрэваапрацоўчы камбінат, Мазырская мэблевая фабрыка, «Мінскпраектмэбля», Пінская дрэваапрацоўча-фанерная фабрыка, «Івацэвічдрэў», Мастоўскі фанерна-дрэваапрацоўчы камбінат, «Рэчыцадрэў» і інш., якія ўваходзяць у канцэрн «Беллеспаперапрам». У 1991—95 аб'ёмы выпуску прадукцыі паступова зніжаліся. Яе стабілізацыя пачалася з 2-й пал. 1990-х г. Да гэтага часу створана больш за 100 малых і сумесных прадпрыемстваў розных формаў уласнасці, пераважна мэблевых; дзейнічаюць таксама прадпрыемствы ў сістэме лясной гаспадаркі, мясц. прам-сці, быт. абслугоўвання насельніцтва, буд-ва, с.-г. прадпрыемстваў і інш. Каля 70% усёй прадукцыі выпускаюць прадпрыемствы канцэрна «Беллеспаперапрам». Значная частка ідзе на экспарт, пераважна ў Расію.

Да арт. **Дрэваапрацоўчая прамысловасць.** Вытворчасць драўляных шчытоў.

Д.п. шырока развіта ў многіх краінах свету, у т.л. ў ЗША, Швецыі, Фінляндыі, Нарвегіі, Канадзе, з якіх шмат прадукцыі экспартуецца. Высокаразвітая Д.п. Германіі і Японіі ў асноўным працуе на прывазной сыравіне. Высокі ўзровень Д.п. ў Італіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Швейцарыі, Данніі, Бельгіі, Славеніі і інш., якія таксама імпартуюць сыравіну і паўфабрыкаты. Д.п. развіваецца ў Чэхіі, Славакіі, Польшчы, Румыніі, Венгрыі, Балгарыі, краінах-Прыбалтыкі. З краін СНД найб. развітая ў Расіі, якая мае вял. запасы драўніны і забяспечвае ляснымі рэсурсамі многія краіны свету, на Украіне.

Тэхн. прагрэс у Д.п. цесна звязаны з н.-д. дзейнасцю, вывучэннем яе фізіка-мех. уласцівасцей, распрацоўкай новых матэрыялаў, тэхналогій і абсталявання, канструяваннем мэблі і інш. вырабаў. Гэтыя работы выконваюцца ў Бел. дзярж. тэхнал. ун-це, НВА «Мінскпраектмэбля», буйнейшымі дрэваапр. аб'яднаннямі.

Літ.: Экономика Советской Белоруссии, 1917—1967. Мн., 1967; Барташевич А.А., Богомазов В.В. Технология изделий из древесины. Мн., 1995; Янушкевіч А.А. Тэхналогія лесапільна-дрэваапрацоўчых вытворчасцей. Мн., 1997.

А.А.Барташэвіч.

ДРЭВААПРАЦО́ЎЧЫЯ МАШЫ́НЫ, машыны і абсталяванне, якія выконваюць розныя тэхнал. аперацыі *апрацоўкі драўніны* або драўняных матэрыялаў. Падзяляюцца на *дрэварэзальныя станкі* (аснашчаюцца розным *дрэварэзальным інструментам*), гнутарныя, зборачныя, для нанясення клею, аддзелачныя станкі і прэсы.

На гнутарных станках загатоўкам надаюць пэўную форму без парушэння сувязей паміж часцінкамі драўніны (выгінаннем па шаблоне, з прапарваннем і прапарваннем, з наступнай сушкай у замацаваным становішчы). Зборачныя станкі выкарыстоўваюць для злучэння (шыпамі, шрубамі, цвікамі і інш.) дэталей у вузлы і гатовыя вырабы (зборка рамак, корпусных вырабаў і інш.; гл. *Шчытазборачныя станкі*). Станкі для нанясення клею аснашчаюць клеемяшалкамі, упырскваль-нымі механізмамі, клеенамазвальнымі вальцамі і інш. На аддзелачных станках рыхтуюць паверхню вырабаў (грунтуюць, шпаклююць, наносяць фарбу і тэкстурны рысунак), наносяць лакафарбавыя матэрыялы, шліфуюць і аздабляюць паверхню, робяць плёначныя і дэкар. пакрыцці. На прэсах вырабляюць шматслойную фанеру, драўнянастружкавыя пліты і інш. У *дрэваапрацоўчай прамысловасці* карыстаюцца таксама агрэгатнымі станкамі, станкамі-аўтаматамі і паўаўтаматамі, аўтам. і паўаўтам. станочнымі лініямі. Рабочыя органы Д.м. падзяляюцца на галоўныя (выконваюць прыёмы, якія вызначаюць працэс апрацоўкі, напр. рэзанне, падачу) і дапаможныя (выконваюць функцыі базіравання, напрамку, фіксацыі, пагрузачна-разгрузачныя, кантрольныя і інш.).

Літ.: Амалицкий В.В., Санев В.И. Оборудование и инструмент деревообрабатывающих предприятий. М., 1992.

А.А.Барташэвіч.

ДРЭ́ВАВЫЯ РАСЛІ́НЫ, шматгадовыя расліны з адраўнелымі сцябламі. У залежнасці ад характару і ступені адраўнення падзяляюцца на *дрэвы, кусты, кусцікі, паўкусты, паўкусцікі, ліяны.* На Беларусі больш за 100 дзікарослых і каля 1500 інтрадукаваных відаў.



Схемы **дрэваапрацоўчых машын**: *а* — даўбёжных станкоў (ланцуговафрэзернага і з гнездавой фрэзай); *б* — драбільных станкоў; *в* — шліфавальнага цыліндрычнага станка; *г* — гнутарнага станка (1 — шаблон, 2 — дэталь, 3 — шына, 4 — прасавальны ролік); *д* — вальцоў для нанясення клею (1 — дазіравальны ролік, 2 — валец, які наносіць клей 3 на дэталь 4); *е* — прэса (1 — матрыца, 2 — пуансон, 3 — дэталі, якія склейваюцца); *ж* — вальцовага станка для нанясення лаку (1 — дазіравальны ролік, 2 — валец, які наносіць лак на дэталь 3); *з* — лаканаліўной машыны (1 — транспарцёры, 2 — дэталь, 3 — лаканаліўная галоўка, 4 — слой лаку, 5 — лаказлівы латак).

ДРЭВАГРЫ́ЗЫ (Lyctidae), сямейства жукоў падатр. рознаедных. Каля 100 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя палярных абласцей, найб. у тропіках. Шкоднікі драўніны і вырабаў з яе. На Беларусі часцей трапляецца Д. баразнаваты, або лінейны (Lyctus linearis).

Даўж. 2,5—5 мм. Цела прадаўгаватае, зверху плоскатае, бурае. Пярэдняспінка з прытупленымі вугламі, з шырокай падоўжнай баразёнкай пасярэдзіне. Надкрылы з тонкімі кропкавымі баразёнкамі і тонкімі валаскамі. Лапкі 5-члянікавыя з рэдукаваным першым члянікам; вусікі з 2-члянікавай булавой. Лічынкі бязногія, белыя. Развіваюцца ў сухой драўніне, якой кормяцца лічынкі і жукі. Пракладваюць хады ў драўніне і ператвараюць яе паверхневыя слаі ў парахню.

Дрэвагрыз баразнаваты.

ДРЭВАГУ́БЦА, чырвонапузырнік (Celastrus), род кветкавых раслін сям. брызглінавых. Каля 30 відаў. Пашыраны ва Усх. Азіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі ў Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі інтрадукаваны 5 відаў і 1 форма. Д. круглалісты (C. orbiculata) рэкамендаваны для зялёнага буд-ва.

Дрэвавыя густагалінастыя ліяны з доўгімі цыліндрычнымі парасткамі. Лісце простае, эліпсападобнае, бліскучае, цёмна-зялёнае, увосень ярка-жоўтае. Кветкі дробныя, непрыкметныя, зеленаватыя, у пазушных мяцёлках. Плод — каробачка. Дэкар. і лек. расліны. Размнажаюцца насеннем і вегетатыўна. Выкарыстоўваюць для верт. азеляненне. Нельга высаджваць каля дрэў і кустоў (парасткі Д. сціскаюць ствол і расліна-апора гіне, адсюль назва роду). *Г.У.Вынаеў.*

Дрэвагубца круглалісты.

Да арт. **Дрэварыт**. Дачка фараона і Майсей. Гравюра з тытульнага ліста кнігі «Выхад» Ф.Скарыны. 1519.

Да арт. **Дрэварыт**. М.Сеўрук. Вяртанне з працы. 1938.

ДРЭВАРЫ́Т, ксілаграфія, гравюра па дрэве; адзін з найб. стараж. відаў пукатай гравюры, у якой адлюстраванне друкуецца з плоскай паверхні драўлянай дошкі, пакрытай фарбай. Бывае абразны (падоўжны) і тарцовы. У абразным Д. друкарская форма (*клішэ*) ствараецца на дошцы, распілаванай уздоўж валокнаў драўніны мяккіх парод. Лініі і плямы, што ўтвараюць малюнак, абразаюць нажом, свабодныя ад выявы месцы паглыбляюць долатам. Гэтаму віду Д. ўласцівы абагульненасць малюнка, кантрастныя суадносіны белага і чорнага колераў. Клішэ тарцовага Д. выконваюцца на брусках цвёрдых парод драўніны, распілаваных упоперак валакна. Тонкія штрыхі малюнка праразаюцца штыхелем. Спалучэнні штрыхоў даюць магчымасць ствараць тоны рознай насычанасці, што часта выкарыстоўваецца для рэпрадуцыравання жывапісных твораў і танальнага малюнка.



Да арт. **Дрэварыт**. А.Зайцаў. Партрэт Л.Стрыгалёва. 1983.

Д. вядомы з 6—7 ст. (Кітай), у Еўропе з'явіўся ў 14—15 ст. У 19 ст. шырока выкарыстоўваўся для друкавання ілюстрацый і рэпрадуцыравання жывапісу і малюнкаў. У 20 ст. пашыраны гал. чынам у станковай і кніжнай гравюры.

На Беларусі першыя Д. (абразныя) з'явіліся ў пач. 16 ст. ў выданнях Ф.Скарыны («Псалтыр», «Кніга Іова», «Кніга Ісуса Сірахава», усе 1517, кн. «Выхад», 1519). Кніжны Д. дамінаваў да пач. 17 ст. Склаліся рэгіянальныя школы бел. Д. (*Віленская школа гравюры, Куцеінская школа гравюры, Магілёўская школа гравюры* і інш.). У кніжнай графіцы працавалі П.Мсціслявец, М. і В.Вашчанкі, Ф.Ангілейка і інш. У 18 ст. пашырыўся станковы Д., у т.л. народны лубок. Д. бел. старадрукаў адметны высокім узроўнем тэхнікі гравіравання і маст. якасцей. У 19 ст. Д. заняпаў. У 1-й пал. 20 ст. ў тэхніцы Д. працавалі М.Сеўрук, І.Гембіцкі, Я.Мінін, С.Юдовін, А.Тычына, А.Зайцаў і інш. У апош-

ні час Д. саступіў месца інш. відам гравюры (*афорт*, *літаграфія*, лінарыт і інш.). *Т.М.Карэліна, В.Ф.Шматаў.*

ДРЭВАРЭ́ЗАЛЬНЫ ІНСТРУМЕ́НТ, інструмент для мех. апрацоўкі натуральнай *драўніны* і *драўняных матэрыялаў* рэзаннем. Складаецца з рэзальнай часткі (робіцца са зносаўстойлівых інструментальных сталей, цвёрдых сплаваў, абразіўных матэрыялаў) і мацавальнага прыстасавання (для замацоўвання на *дрэварэзальных станках* або ўтрымлівання ў руках). Бывае ручны, механізаваны і станочны.

Ручны Д. і. — *пілы* (лучковыя, двухручныя, нажоўкі), *стругі* (рубанкі, фуганкі, цыклі), *долаты*, *свердлы*, ручныя *дрылі*, корбы, сякеры, стамескі, штыхелі і інш. З'яўляецца часткай *сталярна-цяслярнага інструменту*. Механізаваны Д. і. — ручны інструмент з эл., пнеўматычным і інш. прыводам (эл. і бензінавыя *ланцуговыя пілы*, пнеўма- і электрадрылі, электрарубанкі і інш.). Станочны Д. і. — пілы (у выглядзе палатна, стужкі, дыска, цыліндра, устанаўліваюцца на распіловачных станках); *фрэзы* (насадныя і канцавыя, суцэльныя, састаўныя і зборныя), нажы стругальныя, лушчыльныя і інш., разцы токарныя (на фрэзерных, стругальных, лушчыльных, рубільных, токарных станках); свердлы, *зенкеры*, долаты, а таксама цыліндры, дыскі, бясконцыя стужкі з абразіўнай шкуркай, паліравальныя барабаны з абразіўнай пастай (на свідравальных, даўбёжных, шліфавальных і паліравальных станках).

Літ.: Грубе А.Э. Дереворежущие инструменты. 3 изд. М., 1971; Амалицкий В.В., Санев В.И. Оборудование и инструмент деревообрабатывающих предприятий. М., 1992. *А.А.Барташэвіч.*

ДРЭВАРЭ́ЗАЛЬНЫЯ СТАНКІ́, станкі для *апрацоўкі драўніны* і драўняных матэрыялаў рэзаннем. На іх вырабляюць загатоўкі, дэталі і вырабы зададзеных формаў і памераў з паверхняй неабходнай якасці. Падзяляюцца на станкі, якія працуюць без здрабнення драўніны (*стругальныя станкі*, *лушчыльныя станкі*, нажніцы) і якія здрабняюць частку драўніны.

Да Д.с., якія працуюць са здрабненнем часткі драўніны, адносяцца: пілавальныя (*лесапільныя рамы*, *стужачнапільныя станкі*, *круглапільныя станкі*), *фрэзерныя станкі* (у т.л. *фугавальныя станкі*, *рэйсмусавыя станкі*, *шыпарэзныя станкі*), *свідравальныя станкі*, *даўбёжныя станкі*, *шліфавальныя станкі*, *токарныя станкі*, акорвальныя і драбільныя. Адрозніваюць Д.с. адна- і многашпіндэльныя; нізкай, сярэдняй, высокай дакладнасці і асабліва дакладныя; агульнага прызначэння, спецыялізаваныя і спецыяльныя. На Беларусі Д.с. і інш. *дрэваапрацоўчыя машыны* выпускаюцца мінскімі ВА па выпуску аўтам. ліній, працяжных і адразных станкоў, Баранавіцкім з-дам аўтам. ліній, Гомельскім і Аршанскім станкабуд. з-дамі, Віцебскім з-дам заточных станкоў і інш. *А.А.Барташэвіч.*

ДРЭВАСТО́Й, сукупнасць дрэў у лесе, асноўны кампанент лясных фітацэнозаў. Бывае чысты (складаецца з 1 віду дрэў) і мяшаны (з некалькіх відаў), просты (дрэвы растуць у 1 ярусе) і складаны (дрэвы ўтвараюць 2 і больш ярусаў), прыроднага паходжання (за кошт насеннага або вегетатыўнага аднаўлення) і штучнага (ствараецца сяўбой або насаджэннем). Паводле ўзросту



Станочны **дрэварэзальны інструмент**: 1, 2 — круглая (дыскавая) і паласавая (рамная) пілы; 3 — нож для стругання; 4—6 — цэльная, зборная і канцавая фрэзы; 7 — нож для фасоннага фрэзеравання; 8 — свердзел; 9 — свердзел, скамбінаваны з зенкерам; 10 — ланцуговае долата.

адрозніваюць маладнякі, сярэднеўзроставыя, прыспяваючыя, спелыя і перастойныя Д. Прадукцыйнасць характарызуецца *банітэтам* і запасам драўніны на 1 га. Ступень гушчыні Д. вызначаецца паўнатой (шчыльнасць стаяння дрэў на 1 га). У лясах Беларусі сярэднія банітэт Д. II,0, паўната 0,7, запас спелага Д. каля 200 м^3/га. Заканамернасці будовы і росту Д. вывучае лясная таксацыя.

ДРЭВЫ

Склад і прадукцыйнасць іх вызначаюцца пры *лесаўпараджаванні*.

ДРЭВАШКЛАПЛА́СТЫКІ, машынабудаўнічыя матэрыялы, атрыманыя на аснове спалучэння драўніны з палімерамі, шкловалакном і інш. кампанентамі. Забяспечваюць работу вырабаў пры т-ры ад -60 да 150 °С ва ўмовах агрэсіўна-абразіўных асяроддзяў. Выкарыстоўваюцца ў тэхнал. абсталяванні хім., аўтамаб., трактарнай і інш. галін прам-сці. На Беларусі даследуюцца з 1963 у Ін-це механікі металапалімерных сістэм Нац. АН, дзе створаны канструкцыйныя Д. (атрымліваюць метадам гарачага ўшчыльнення кампазіту са здробненай драўніны, насычанай кандэнсавальнымі смоламі, і шкляного валакна, насычанага палімерамі) і самазмазвальныя (атрымліваюць напаўненнем лігнавугляводнай матрыцы драўніны тэрмастабільнымі калоіднымі актыўнымі сістэмамі; выкарыстоўваюцца як падшыпнікі слізгання). *Б.І.Купчынаў.*

ДРЭ́ВЫ-ПО́МНІКІ, дрэвы, якія лічацца каштоўнымі аб'ектамі жывой прыроды ці культурна-гістарычнымі аб'ектамі і ахоўваюцца дзяржавай; *помнікі прыроды*. Бываюць рэсп. і мясцовага значэння. На Беларусі каля 120 асобных Д.-п. аб'яўлены помнікамі прыроды (рэсп. значэння каля 90). Да іх належаць векавыя дрэвы (у т.л. дубы-волаты, напр., цар-дуб у Маларыцкім, Суворайскі дуб у Кобрынскім р-нах Брэсцкай вобл.,



Функцыянальныя схемы **дрэварэзальных станкоў**: *а* — стужачнапільнага (1 — дыск, 2 — стужачная піла); *б* — круглапільнага (1 — пільны дыск, 2 — дэталь); *в* — рэйсмусавага (1 — нажавы вал); *г* — лушчыльнага (1 — цурбак, 2 — шпона, 3 — нож); *д* — 4-баковага стругальнага (1 — нажавыя галоўкі, 2 — нажавыя валы); *е* — свідравальнага; *ж* — шыпарэзнага (1 — фрэзы), з — шліфавальнага з кантактным прасікам (1 — дэталь, 2 — прыціскны прасік, 3 — шліфавальная стужка); *і* — шліфавальнага з кантактным вальцам (1 — шліфавальная стужка, 2 — дэталь).

дуб-волат у Докшыцкім р-не Віцебскай вобл.) і дрэвы рэдкіх інтрадукаваных відаў (напр., карыя авальная ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл., ліпа каралінская ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл., хвоя кедравая еўрапейская ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл.). Помнікамі прыроды рэсп. і мясцовага значэння лічацца таксама 95 груп Д.-п. (30 — рэсп. значэння). Гэта натуральныя ўчасткі лесу (дубровы, хвойнікі, бярэзнікі, ясеннікі) і насаджэнні з удзелам інтрадукаваных відаў (напр., лістоўніцы ў Баранавіцкім, хвоі веймутавай у Пружанскім р-нах Брэсцкай вобл.). Ахова Д.-п. прадугледжвае перадачу іх пад ахоўнае абавязацельства, паспартызацыю, прафілактычнае і бягучае лячэнне (Іл. гл. ў арт. *Батанічныя помнікі прыроды*).

ДРЭДНО́ЎТ (англ. dreadnought літар. бясстрашны), клас *лінейных караблёў*, якія ў пач. 20 ст. замянілі эскадраныя *браняносцы*. Мае адзіныя калібры ўсёй



Да арт. **Дрэдноўт**. Англійскі карабель «Дрэдноўт».

гал. і процімінная артылерыі, павялічаную скорасць руху (у параўн. з браняносцамі), процімінную ахову, рамбічнае размяшчэнне артыл. вежаў і інш. Першым з іх у 1906 пабудаваны англ. лінкор, які меў назву «Д.»; у Расіі Д. тыпу «Севастопаль» праектаваліся і будаваліся з 1909 пад кіраўніцтвам А.М.*Крылова* і І.Р.Бубнава.

ДРЭ́ЕР (Dreyer) Карл Тэадор (3.2.1889, Капенгаген — 20.3.1968), дацкі кінарэжысёр, сцэнарыст. Адзін са стваральнікаў дацкага маст. кінематографа. Рэжысёрскую дзейнасць пачаў у 1918. Ужо ў фільме «Старонкі з Кнігі Сатаны» (1920) выявілася яго імкненне да максімальнай выразнасці кінамовы. У фільмах «Удава пастара» (1920, Швецыя), «Міхаэль» (1924, Германія), «Паважай сваю жонку» (1925) фарміруецца асн. тэма творчасці Д. — адзіноцтва чалавека, які адстойвае сваю духоўную свабоду, асуджанага іншы раз на пагібель. Найб. поўна гэта тэма раскрыта ў фільме «Страсці Жанны д'Арк» (1927, Францыя) — адным з самых значных дасягненняў «нямога» кіно. Сярод інш. фільмаў: «Дзень гневу» (1943), «Слова» (1955), «Гертруда» (1965). Здымаў таксама дакумент. фільмы.

ДРЭ́ЕРЭ (Dreiere) Зіта (дзявочае Э р с; н. 6.8.1952, Рыга), латышская артыстка балета. Нар. арт. Латвіі (1976). Нар. арт. СССР (1989). Скончыла Рыжскае харэаграфічнае вучылішча (1969). З 1969 салістка Дзярж. акад. т-ра оперы і балета Латвіі (цяпер Нац. опера Латвіі). Сярод партый: Аўрора («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Жызэль, Медора («Жызэль», «Карсар» А.Адана), Кітры («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Эсмеральда («Эсмеральда» Ц.Пуні), Ліенітэ («Спрыдытыс» А.Жылінскіса). Творчасць Д. адметная тэхн. майстэрствам, драм. выразнасцю, пластычнасцю, эмацыянальнасцю.

ДРЭ́ЗДЭН (Dresden), горад на У Германіі, на р. Эльба. Адм. ц. зямлі Саксонія. 519,9 тыс. ж., з прыгарадамі больш за 600 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог, рачны порт. Міжнар. аэрапорт. Важны прамысл., гандл., навук. і культ. цэнтр. Прам-сць: эл.-тэхн. (трансфарматары, халадзільнікі, цеплатэхн. і вакуумнае абсталяванне), радыёэлектронная (асабліва паўправаднікі), прылада- буд., аптычная (выт-сць кіна- і фотаоптыкі), паліграф., трыкат., швейная, абутковая, мэблевая, харчасмакавая (у т.л. тытунёвая, піваварная, шакаладная і інш.), дакладнае машынабудаванне (рэнтгенаўскія апараты, кіна- і фотаапаратура), выт-сць станкоў, рачных суднаў, хім.-фармацэўтычных прэпаратаў. Традыцыйная выт-сць фарфоравых і шкляных вырабаў. Тэхн. ун-т. Цэнтр ядз. даследаванняў.

Першапачаткова вёска палабскіх славян (наз. Дрэздзаны). Горад засн. ў 1216 у ходзе герм. каланізацыі, з 1403 меў гар. правы. З 1485 рэзідэнцыя герцагаў альберцінскай лініі саксонскага княжацкага роду Ветынаў. Месца заключэння *Дрэздэнскага міру 1745*. Акупіраваны прускімі войскамі (1756—59) і значна разбураны ў Сямігадовую вайну 1756—63. З 1806 сталіца *Саксоніі*. У перыяд напалеонаўскіх войнаў каля горада адбылася Дрэздэнская бітва 1813. Значныя сац. хваляванні ў час рэвалюцый 1830, 1848—49 і рэв. крызісу 1923 у Германіі. У 2-ю сусв. вайну моцна разбураны бамбардзіроўкамі англа-амер. ВПС. 3 мая 1945 у сав. зоне акупацыі Германіі. У 1949—90 у складзе Герм. Дэмакр. Рэспублікі, з 1990 — аб'яднанай ФРГ.

Аблічча Д. вызначаюць паркі (палацава-паркавы ансамбль Пільніц, 1720—24; арх. М.Д.Пёпельман) і масты цераз Эльбу, што злучаюць Стары горад з Новым, забудаваным пераважна ў 19—20 ст. У Старым горадзе захавалася адносна правільная сярэдневяковая сетка вуліц з цэнтр. пл. Постплац. Замак (засн. каля 1200, пабудаваны ў 15—19 ст.) разам з прылеглай сярэдневяковай і барочнай забудовай стварае ядро «Фронту Эльбы» (тэрасу Бруля). Сярод інш. славутасцей барочны палацавы ансамбль Цвінгер (1711—22, арх. Пёпельман), царква Гофкірхе (1738—56, арх. Г.К'яверы), будынак Дрэздэнскай карціннай галерэі і інш. Амаль цалкам адноўлены пасля 2-й сусв. вайны. Музеі: *Дрэздэнская карцінная галерэя*, гіст. музей, Збор фарфору «Зялёны звод» (калекцыя саксонскіх ювелірных вырабаў), Музей нар. мастацтва і інш.

ДРЭ́ЗДЭНСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1849, адно з узбр. выступленняў на апошнім этапе *Рэвалюцыі 1848—49 у Германіі* ў абарону імперскай канстытуцыі, прынятай 27.3.1849 Франкфурцкім парламентам. Адбылося 3—9.5.1849 у г. Дрэздэн як рэакцыя гараджан на адмову саксонскага караля Фрыдрыха Аўгуста

Да арт. **Дрэздэн**. Б.Б е л о т а. Плошча Новага рынку ў Дрэздэне. 1749—51.

прызнаць канстытуцыю. Каля 12 тыс. паўстанцаў (рабочыя, муніцыпальная гвардыя і інш., у т.л. кампазітар Р.Вагнер) пад кіраўніцтвам левых радыкалаў С.Чырнера, С.Борна і рас. эмігранта М.А.Бакуніна ўзялі штурмам цэйхгаўз і стварылі барыкады ў старой ч. горада. Ліквідавана вял. сіламі саксонскіх войск з дапамогай прускіх часцей; многія ўдзельнікі паўстання былі прыгавораны ваен. судамі да пакарання смерцю (пазней памілаваны).

ДРЭ́ЗДЭНСКАЯ КАРЦІ́ННАЯ ГАЛЕРЭ́Я, адна з буйнейшых у свеце калекцый жывапісу. Уваходзіць у склад Дрэздэнскіх маст. збораў. Засн. ў 1560 г. у г. Дрэздэн як палацавы збор саксонскіх курфюрстаў. Пашырана ў 1722, з пабудовай у 1847—56 спец. будынка (арх. Г.Земпер, М.Генель; разбураны пры бамбардзіроўцы Дрэздэна ў лют. 1945, адноўлены да 1956), які ўвайшоў у палацавы ансамбль *Цвінгер*, адкрыта для публікі. У 1945 значная частка збораў Д.к.г. вывезена ў СССР і пасля рэстаўрацыі вернута ў 1955 у Дрэздэн. Асн. частка Д.к.г. — Галерэя старых майстроў (карціны Я. ван Эйка, Джарджоне, Рафаэля, Тыцыяна, А.Дзюрэра, П.П.Рубенса, Рэмбранта, Н.Пусэна і інш.). Галерэя новых майстроў (размешчана ў палацава-паркавым ансамблі Дрэздэн) захоўвае творы еўрап. маст. школ 19—20 ст.

Літ.: Зейдевитц Р., Зейдевитц М. Дрезденская галерея: [Сокр. пер. с нем.]. М., 1965; Alpatow M. Die Dresdner Galerie: Alte Meister. Dresden, 1966.

ДРЭ́ЗДЭНСКІ МІР 1745. Заключаны 25.12.1745 у *Дрэздэне* паміж Прусіяй (кароль Фрыдрых II) з аднаго боку, Аўстрыяй (эрцгерцагіня Марыя Тэрэзія) і Саксоніяй (курфюрст Аўгуст III) — з другога. Завяршыў 2-ю Сілезскую вайну (гл. *Сілезскія войны*) — частку вайны за *Аўстрыйскую спадчыну* 1740—48. Паводле яго Аўстрыя ўступіла Прусіі амаль усю Сілезію, а Фрыдрых II пагадзіўся прызнаць герм. імператарам мужа Марыі Тэрэзіі Франца Стафана Латарынгскага. Умовы Д.м. пацвердзіў Ахенскі мірны дагавор 1748.

ДРЭ́ЙЗІН Юльян Мікалаевіч (22.6.1879, г. Днепрапятроўск, Украіна — 28.3.1942), бел. музыказнавец, публіцыст, перакладчык. Скончыў Маскоўскі ун-т (1908). У 1925—35 выкладчык Бел. муз. тэхнікума і Бел. кансерваторыі, БДУ, АН БССР, з 1935 Маскоўскага ун-та. Вёў муз.-асв. дзейнасць. Аўтар шматлікіх артыкулаў па актуальных пытаннях бел. муз. мастацтва. Складальнік слоўніка «Музычныя тэрміны» (серыя «Беларуская навуковая тэрміналогія», 1926). Пераклаў з арыгінала на бел. мову лібрэта опер «Кармэн» Ж.Бізэ, «Фауст» Ш.Гуно, «Севільскі цырульнік» Дж.Расіні, «Русалка» А.Даргамыжскага, «Залаты пеўнік» М.Рымскага-Корсакава і інш.; (паст. ў Дзярж. т-ры оперы і балета БССР), творы ант. аўтараў, у т.л. «Антыгону» Сафокла, «Вакханкі» Эўрыпіда. Аўтар лібрэта оперы «Тарас на Парнасе» М.Аладава.

Тв.: Новыя плыні ў сучаснай музыцы // Полымя. 1925. № 3; Музыка ў творах беларускіх паэтаў // Там жа. № 4, 6; Праблемы нацыянальнай музыкі // Маладняк. 1926. № 11; Музыкальная жизнь Белоруссии // Сов. музыка. 1934. № 7.

Літ.: Дубкова Т.А. Некаторыя пытанні развіцця беларускай эстэтыкі і музычнай крытыкі // Музыка нашых дзён. Мн., 1974.

Т.А.Дубкова.

ДРЭЙК (Drake) Фрэнсіс (каля 1540, Кроўндэйл, каля г. Плімут, Вялікабрытанія — 28.1.1596), англійскі мараплавец. Віцэ-адмірал (1588). На флоце з 15 гадоў. Кіраўнік шэрагу антыіспанскіх пірацкіх экспедыцый у Вест-Індыю (1567—77, 1586); у час экспедыцыі 1577—80 (выйшла з Плімута) здзейсніў 2-е (пасля Ф.*Магелана*) кругасветнае плаванне, прайшоў Магеланаў праліў, выявіў новы праліў (у 19 ст. названы *Дрэйка праліў*), даказаў, што Вогненная Зямля не выступ Паўд. мацерыка, а асобны архіпелаг, адкрыў бухту Сан-Францыска. Меў падтрымку з боку каралевы Лізаветы I Цюдар. У 1587 здзейсніў напад на порт Кадыс (Іспанія). У 1588 фактычна камандаваў англ. флотам пры разгроме ісп. *«Непераможнай арманды»*. Памёр у час чарговай пірацкай экспедыцыі

Дрэздэн. Панарама горада.

Літ.: Магидович И.П., Магидович В.И. Очерки по истории географических открытий. 3 изд. М., 1983. [Т]. 2. С. 315—320.

М.К.Багадзяж.

ДРЭ́ЙКА ПРАЛІ́Ў (Drake Strait), праліў паміж архіпелагам Вогненная Зямля і Паўд. Шэтландскімі а-вамі. Злучае Атлантычны і Ціхі ак. Даўж. 460 км. Самы шырокі (да 1120 км) праліў на Зямлі. Глыб. да 5249 м. Штормы, айсбергі. Названы ў гонар англ. мараплаўца Ф.*Дрэйка*.

Ф.Дрэйк.

ДРЭЙСЕ́НЫ (Dreissena), род двухстворкавых малюскаў. Каля 10 відаў. Пашыраны ў саланаватых і прэсных водах узбярэжжаў трапічнай часткі Атлантычнага ак., Еўропы, М. Азіі, у Чорным, Каспійскім і Аральскім морах. Жывуць калоніямі на падводных прадметах, збудаваннях, пясчаным грунце. Найб. вядомая Д. рачная (D. polymorpha). У Беларусі пашыраны на Пн, у рэках Прыпяць і Нёман.

1 2

Дрэйсена рачная: 1 — адзіночная, прымацаваная да субстрату; 2 — гронка малюскаў, змацаваная бісуснымі ніткамі.

Ракавіна (даўж. 0,8—5 см) клінападобная, зеленаватая або карычневая з папярочнымі цёмнымі палосамі. Маюць бісусавую залозу, сакрэт якой у вадзе становіцца цвёрдым у выглядзе нітак, якімі Д. прымацоўваюцца да субстрату. Раздзельнаполыя. Лічынка (велігер) свабодна плавае, хутка засяляе новыя вадаёмы. Кормяцца рэшткамі раслін і жывёл. Біяфільтратары.

ДРЭЙФ ГЕ́НАЎ, генетыка-аўтаматычныя працэсы ў папуляцыі, змяненне генет. структуры (частаты генаў) *папуляцыі* ў выніку выпадковых прычын. Тэрмін Д.г. прапанаваў амер. генетык С.Райт (1931). Праяўляецца звычайна пры невял. колькасці папуляцыі (напр., рэзкім яе скарачэнні ў выпадку стыхійных бедстваў, развіцці эпізаотый і інш.). Пад дзеяннем Д.г. узмацняецца працэс го-

мазігатызацыі структуры папуляцыі, што нарастае з памяншэннем яе колькасці. Нарастанне абумоўлена павелічэннем частаты блізкароднасных скрыжаванняў у невял. папуляцыях, калі ў выніку выпадковых ваганняў частот асобных генаў адбываецца замацаванне адных алеляў пры адначасовай страце іншых. Некат. з атрыманых гомазіготных формаў у новых умовах асяроддзя могуць стаць прыстасавальна каштоўнымі і дзякуючы адбору атрымаць вял. пашырэнне пры наступным павелічэнні колькасці папуляцый.

ДРЭЙФ ІЛЬДО́Ў, рух ільдоў у вадаёмах пад уздзеяннем вятроў і цячэнняў. Ад дзеяння сілы вярчэння Зямлі адбываецца адхіленне лёду ад напрамку ветру ў сярэднім на 30° управа ў арктычных і ўлева ў антарктычных шыротах. Скорасць ветравога Д.і. у 50 разоў меншая за скорасць ветру. На характар Д.і. уплываюць берагі, астравы, водмелі. Больш павольна, чым ледзяныя палі, дрэйфуюць *айсбергі*. Магутныя халодныя цячэнні (Лабрадорскае, Перуанскае) выносяць палярныя льды ва ўмераныя, радзей субтрапічныя шыроты.

ДРЭЙФ КАНТЫНЕ́НТАЎ, павольныя (да некалькіх сантыметраў за год) гарызантальныя перамяшчэнні вял. участкаў зямной кары (кантынентаў); гл. ў арт. *Мабілізм* і *Тэктанічныя гіпотэзы*.

ДРЭ́ЙФАВЫЯ ЦЯЧЭ́ННІ, цячэнні, абумоўленыя ўздзеяннем на паверхню вадаёма працяглых або пануючых вятроў, якія супадаюць з імі па напрамку. Гл. таксама *Ветравыя цячэнні*.

ДРЭНА́Ж (франц. drainage ад англ. drain асушаць), сістэма штучных вадатокаў — дрэнаў (труб, свідравін, поласцей і інш.), якія збіраюць і адводзяць залішнюю ваду з с.-г. зямель, ад збудаванняў, зніжаюць узровень падземных (грунтавых) вод. Выкарыстоўваецца пры *меліярацыі*, буд-ве, торфаздабычы, асваенні рудных радовішчаў і інш.

Д. с.-г. можа выкарыстоўвацца для асушэння, увільгатнення і рассольвання зямель. Адрозніваюць Д. гарыз. (трубчасты і поласцевы), верт. (сістэма свідравін) і камбінаваны (спалучэнне гарыз. дрэн са свідравінамі або калодзежамі). Робіцца з дапамогай *дрэнажных машын*, экскаватараў. У выкапаную траншэю або шчыліну укладваюць трубы з розных матэрыялаў. Керамічныя (ганчарныя) гарыз. дрэны кладуць упрытык, стыкі абкладаюць фільтравальнымі матэрыяламі, потым траншэю засыпаюць; пластмасавыя дрэны ўкладваюць і бестраншэйным спосабам (напр., з бухты) — у вузкую шчыліну ў грунце. У залежнасці ад размяшчэння дрэн на асушальнай плошчы адрозніваюць Д.: сістэматычны (паралельныя адна адной дрэны або свідравіны раўнамерна размеркаваны па тэр.); выбарачны, або тальвегавы (робіцца на асобных паніжэннях рэльефу); галаўны, або нагорналоўчы (для перахопу падземных вод з боку схілу); берагавы (для перахопу вады з боку ракі або вадасховішча пры падтапленні). У засушлівы перыяд Д. можа выкарыстоўвацца для ўвільгатнення зямель (падачай вады ў дрэнажныя сістэмы). У засушлівых зонах Д. выкарыстоўваюць для баранцьбы з засаленнем арашальных зямель. Д. збудаванняў робяць (у выглядзе сістэмы труб, свідравін, латакоў, галерэй, штольняў і інш.) для асушэння і ўмацавання асноў будынкаў, плацін, дарог, аэрадромаў, для паніжэння фільтрацыйнага ціску вады на збудаванне і інш.



Да арт. **Дрэнаж**. А — дрэнажныя трубы (1—4 — керамічныя, 5—6 — пластмасавыя). Б — схема адводу дрэнамі залішніх вод (1 — паверхня зямлі, 2 — ападкі, 3 — дрэна, 4 — узровень грунтавых вод, 5 — напрамак руху грунтавых вод, 6 — водаўпор). В — схема дрэнажнай сістэмы (1 — дрэны, 2, 3, 4 — калектары, 5 — назіральны калодзеж, 6 — фільтр-паглынальнік, 7 — канал). Г — схема цюфяковага дрэнажу земляной плаціны (1 — адваротны фільтр, 2 — цюфячная дрэна, 3 — вывадны калектар). Д — схема ўкладкі пластмасавага дрэнажу (1 — бухта труб, 2 — дрэнаўкладчык ЭТЦ-202А, 3 — бабіны шклопалатна).

Літ.: Мурашко А.И. Сельскохозяйственный дренаж в гумидной зоне. М., 1982; Осушение земель вертикальным дренажем. Мн., 1980; Пивовар Н.Г., Бугай Н.Г., Рычко В.А. Дренаж с волокнистыми фильтрами. Киев, 1980; Эггельсманн Р. Руководство по дренажу: Пер. с нем. М., 1978. *А.Я.Вакар.*

ДРЭНА́Ж у медыцыне, дрэніраванне, лячэбны метад, пры якім ствараецца магчымасць пастаяннага адтоку вадкасці з полых органаў, поласцей цела, ран і абсцэсаў. Выкарыстоўваюць гумавыя, пластмасавыя ці шкляныя трубкі з адтулінамі, а таксама марлевыя і гумавыя палосы.

ДРЭНА́ЖНЫЯ МАШЫ́НЫ, машыны для будавання і рамонту *дрэнажу* на асушальных і арашальных землях, тарфяных радовішчах. Выкарыстоўваюцца для пракладкі матэрыяльнага (дрэнаўкладчыкі), кротавага (кротадрэнажныя машыны, кратавальнікі) і шчылінага (шчылінна-дрэнажныя машыны) дрэнажу. Бываюць траншэйныя, вузкатраншэйныя і бестраншэйныя; самаходныя, навясныя, прычапныя і паўпрычапныя; з актыўнымі (ланцуговыя многакаўшовыя, скрабалкавыя і ба́равыя, ротарныя многакаўшовыя і скрабалкавыя, фрэзерныя і шнэкавыя) і пасіўнымі (плужныя, нажавыя, кротавыя дрэнеры) рабочымі органамі.

Д.м. неперарыўнага дзеяння з актыўнымі рабочымі органамі выкарыстоўваюць для капання траншэй і ўкладкі дрэнажных труб, з пасіўным рабочым органам і аднакаўшовыя экскаватары — пры рабоце ў грунтах з валунамі. Плужным траншэекапальнікам наразаюць траншэі, потым іх дапрацоўваюць многакаўшовым экскаватарам і ўкладваюць трубы. Бестраншэйшыя Д.м. полым нажом (для прапускання дрэнажных труб) або V-падобным рэзальным інструментам ствараюць шчыліну, у якую прапускаюць дрэнажную трубу. Кротадрэнажныя машыны аснашчаны нажом з прымацаваным да яго дрэнерам. Ёсць машыны з актыўным дрэнерам, прыстасаваннем для ўтварэння дрэны выразаннем адпаведнага аб'ёму грунту. Шчылінна-дрэнажныя машыны з актыўным рабочым органам (дыскавай або вінтавой фрэзай, ба́равым ланцугом) і каткамі, якія закрываюць шчыліну, выкарыстоўваюць для работы на пністых тарфяніках. Машыны для фармавання труб са стужкі з адначасовай іх укладкай маюць трубафармавальны апарат, які фармуе трубы з вінілпласту, поліпрапілену, поліэтылену і інш. матэрыялаў. Дрэнапрамыўныя машыны ачышчаюць дрэнажныя сістэмы (заглееныя трубы) патокам вады пад ціскам (да 100 ат). На Беларусі Д.м. выпускае *Мазырскі завод меліярацыйных машын*.

Літ.: Гл. пры арт. *Меліярацыйныя машыны*. *А.Я.Вакар.*

ДРЭПАНАКЛА́ДУС (Drepanocladus), род брыевых імхоў сям. амблістэгіевых. Вядома 40 відаў. Большасць з іх пашырана ў халодных і ўмераных зонах. На Беларусі 8 відаў, часцей трапляюцца балотныя — Д. глянцаваты (D. vernicosus) і Д. сагнуты (D. aduncus); у вадаёмах пашыраны Д. Зентнера (D. sendtneri), Д. бяскольцавы (D. exannulatus) і Д. плаваючы (D. fluitans); Д. кручкаваты (D. uncinatus) расце ў хвойных і мяшаных лясах. Торфаўтваральнікі.



Дрэнажныя машыны: 1 — траншэйны дрэнаўкладчык ЭТЦ-406; 2 — бестраншэйны дрэнаўкладчык МД-12 (для зоны асушэння); 3 — дрэнапрамыўшчык ПДП-125.

Адна- і двухдомныя лістасцябловыя імхі. Дзярнінкі звычайна бліскучыя, буйныя, зялёныя, жаўтавата-зялёныя, карычневыя, чарнаватыя. Сцябло ляжачае да прамастойнага. Лісце цэльнакрайняе ці пілаватае. Каробачка са спорамі на прамой ножцы, цыліндрычная, сагнутая; вечка з дзюбай або бародаўкай.

ДРЭПАНАФІ́КУС (Drepanophycus), род выкапнёвых раслін кл. дзеразападобных. Вядомы з адкладаў дэвону. Знаходкі Д. вядомы ў Казахстане, на Урале, у Бельгіі, Чэхіі, на Пн Амерыкі, Аўстраліі, на Шпіцбергене. Раслі на нізкіх узбярэжжах, якія перыядычна заліваліся вадой, што стварала мноства прамежкавых біятопаў (ад марскіх да кантынентальных). Найб. пашыраныя віды D. spinaeformis (тыповы від роду), D. gaspianus, D. crepinii, D. spinosus.

Травяністыя расліны выш. да 1 м, з плоскім або акруглым у папярочным сячэнні шчацінкападобным лісцем, якое размешчана па спіралі. Лісце і сцёблы мелі шматлікія вусцейкі. *Т.Р.Абухоўская.*

ДРЭС, гл. *Дзяржаўная раённая электрастанцыя.*

ДРЭСІРО́ЎКА (ад франц. dresser выпраўляць, навучаць), уздзеянне рознымі метадамі на жывёл для выпрацоўкі і замацавання ў іх пэўных умоўных рэфлексаў і навыкаў. Д. скарыстоўваюць пры падрыхтоўцы праграм у цырку, у службовай сабакагадоўлі. «Дзікая», ці болевая Д., калі жывёла выконвае практыкаванні пад страхам пакарання, панавала ў цырку да канца 19 ст. «Мяккая», туманная Д. будуецца на прыёмах ласкавага абыходжання і заахвочвання ежай; яе заснавальнік — ням. дрэсіроўшчык К.Гагенбек, у Расіі — У.Л.Дураў. Комплексная Д. спалучае абодва прынцыпы, распаўсюджана ў сучасным цырку.

Д. ў цырку як жанр мастацтва вядома са старажытнасці (Кітай, Індыя, Егіпет, Стараж. Грэцыя і Рым, Візантыя). Дрэсіраваных сабак, мядзведзяў і інш. жывёл паказвалі ў сярэднія вякі ў Еўропе. У 13—14 ст. асабліва была развіта Д. коней. На Беларусі з 1-й трэці 16 ст. ўпамінаюцца скамарохі, якія выступалі з дрэсіраванымі звярамі. У 1770-я г. вядомы павадыр мядзведзя Т.Марачэўскі. Існавалі школы Д. мядзведзяў у навакольлях Гродна, Нясвіжа, Мінска і інш., найб. вядомая з іх т. зв. *«Смаргонская акадэмія»*. Збераглiся выявы бел. дрэсіроўшчыкаў на вырабах 18 ст. Урэцкай і Налібоцкай гут, на франц. афішах, польск. і ням. гравюрах. У Мінскім і Гомельскім цырках паказваюць атракцыёны з удзелам дрэсіраваных жывёл.

ДРЭ́ТУНСКІ РАЁН. Існаваў у БССР у 1924—25. Утвораны 17.7.1924 у Полацкай акр. Цэнтр — в. Дрэтунь. Пл. 1265 км^2, нас. (на 1.1.1925) 22 319 чал., 438 нас. пунктаў. 20.8.1924 раён падзелены на 11 сельсаветаў. 3.7.1925 перайменаваны ў *Краснапольскі раён.*

ДРЭ́ТУНЬ, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Палата, за 34 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 0,28 км^2, даўж. 840 м, найб. шыр. 440 м, найб. глыб. 3,4 м, даўж. берагавой лініі 2,3 км. Пл. вадазбору 14,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 2—4 м, разараныя, на З пад хмызняком. Дно плоскае, уздоўж

Дрэпанакладус кручкаваты: *а* — расліна, *б* — ліст.

Дрэпанафікус.

берагоў выслана пяском і глеямі, глыбей — сапрапелямі. Зарастае. У возера ўпадае ручай з воз. Чэрмісца, выцякае ручай у р. Палата.

ДРЭ́ЧЫН Сямён Уладзіміравіч (Вульфавіч; 6.1.1915, Мінск — 1.8.1993), бел. артыст балета і балетмайстар. Нар. арт. Беларусі (1954). Скончыў Бел. студыю оперы і балета (1933). У 1933—41 і 1944—59 саліст, у 1950—59 таксама балетмайстар Дзярж. т-ра оперы і балета БССР. У 1942—44 саліст Вял. т-ра СССР. У 1959—64 і 1980—90 працаваў у т-рах Расіі, Украіны, Малдовы. У 1971—73 маст. кіраўнік Дзярж. ансамбля танца БССР, у 1973—80 балетмайстар Дзярж. т-ра муз. камедыі БССР. Першы вядучы класічны танцоўшчык на бел. сцэне. Выканальніцкую манеру Д. вызначалі мужнасць і драм. экспрэсіўнасць танца, высокі артыстызм, пластычнасць, абаяльнасць, сцэнічны тэмперамент. Сярод лепшых партый: нацыянальна самабытныя вобразы Сымона («Салавей» М.Крошнера), Васіля («Князь-возера» В.Залатарова, Дзярж. прэмія СССР 1950), Янкі («Палымяныя сэрцы» на тую ж музыку); у класічных балетах — Гірэй («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Ма Лічэн («Чырвоны мак» Р.Гліэра), Зігфрыд, Дэзірэ («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Базіль («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Конрад («Карсар» А.Адана), Клод («Эсмеральда» Ц.Пуні), Франц («Блакітны Дунай» на муз. І.Штрауса). Сярод пастановак у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі: балеты «Іспанскае капрычыо» на музыку М.Рымскага-Корсакава (1949), «Чырвоны мак» (1950), «Эсмеральда» (1951), «Лаўрэнсія» А.Крэйна (1955), «Карсар» (1957), «Блакітны Дунай» (1958), танцы ў операх «Шукальнікі жэмчугу» Ж.Бізэ (1957), «Зорка Венера» Ю.Семянякі (1970) і інш. У Дзярж. ансамблі танца БССР паставіў фальклорную праграму («Вянок беларускіх народных танцаў», «Купальская ноч», «Янка», «Лявоніха»), кампазіцыі «Хатынь», «У Белавежскай пушчы»). Балетмайстар спектакляў «Паўлінка» Ю.Семянякі (1973), «Несцерка» Р.Суруса (1979), «Рэвю-канцэрта» (1976), рэвю-мазаікі «Вакол кахання» (1991) і інш. ў Дзярж. т-ры муз. камедыі. Ставіў танцы да драм. пастановак, у т.л. «Зацюканы апостал» А.Макаёнка (1971), «Амністыя» М.Матукоўскага (1970), «Памінальная малітва» Р.Горына (1990) у Бел. т-ры імя Я.Купалы і інш.

Літ.: Модэль М. Сямён Дрэчын // Слова пра майстроў сцэны. Мн., 1967; Чурко Ю.М. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988. С. 29—36. *Л.М.Ражанава.*

С.У.Дрэчын.

ДУ́А, Гершан Майсеевіч (парт. псеўд. Д. Боген; 5.5.1892, г. Седльцы, Польшча — 12.11.1948), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. За рэв. дзейнасць у 1916—18 зняволены герм. акупац. ўладамі ў канцлагер. З 1920 у Палесціне, адзін з заснавальнікаў і ген. сакратар ЦК Кампартыі Палесціны, высланы англ. каланіяльнымі ўладамі. У 1925—32 чл. ЦК КПЗБ, прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. Неаднаразова быў арыштаваны польск. ўладамі. У 1933—35 у апараце выканкома Камінтэрна. У 1937 у складзе паліт. кіраўніцтва інтэрнац. брыгад рэсп. Іспаніі. Пасля паражэння рэспублікі эмігрыраваў у Францыю, потым на Кубу, быў карэспандэнтам камуніст. друку ў ЗША. З 1947 у Польшчы.

С.Дрэчын у ролях Янкі (зверху) і Гірэя.

ДУАДЭ́ЦЫМА (ад лац. duodecima дванаццатая), гл. ў арт. *Інтэрвал.*

ДУАЕ́Н (ад франц. doyen старшыня, старэйшына), асоба, якая ўзначальвае дыпламат. корпус у якой-н. краіне. Звычайна Д. — вышэйшы рангам дыпламат. прадстаўнік. Калі некалькі дыпламат. прадстаўнікоў маюць аднолькавы ранг, то Д. — асоба, якая найдаўжэй знаходзіцца ў краіне прызначэння з моманту ўручэння даверчых грамат.

ДУА́ЛА (Douala, Duala), горад на З Камеруна. Знаходзіцца на левым беразе р. Вуры, за 21 км ад яе ўпадзення ў Гвінейскі зал., злучаны мостам з портам Банаберы на правым беразе ракі. Адм. ц. Прыбярэжнай правінцыі. 1200 тыс. ж. (1993). Гал. акіянскі порт, вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Эканам. цэнтр краіны. Прам-сць: тэкст., швейная, харчасмакавая, хім., лесапільная. Праз Д. праходзіць таксама частка тавараабароту Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікі і Чада. Панафрыканскі ін-т развіцця.

ДУАЛІ́ЗМ (ад лац. dualis дваісты), філасофскае вучэнне, якое прызнае існаванне двух раўнапраўных пачаткаў — матэрыі і духа, матэрыяльнага і ідэальнага. Выступае ў якасці антыпода розных формаў *манізму*, прадстаўнікі якога тлумачаць свет на падставе сцвярджэння першаснасці матэрыі або духа. У гісторыі філасофіі Д. накіраваны на прымірэнне маністычных поглядаў і іх сінтэзу ў межах дуалістычнай сістэмы. Тэрмін «Д.» увеў ням. філосаф К.Вольф і выкарыстаў яго для азначэння матэрыяльнай і духоўнай субстанцый. Адзін з буйнейшых прадстаўнікоў Д. — Р.*Дэкарт* лічыў, што быццё падзяляецца на мыслячую (дух) і працяглую (матэрыя) субстанцыі. Суадносіны гэтых субстанцый у чалавека ён вырашаў з пазіцыі псіхафіз. паралелізму, дзе матэрыяльны і духоўны пачаткі выступаюць незалежна адзін ад аднаго. І.*Кант* развіваў вучэнне аб антынамічнасці розуму, якое было падставай дуалістычнага размежавання «рэчаў у сабе» і «з'яў». Для філасофіі новага часу характэрны формы гнасеалагічнага Д. (Дж.Лок, Д.Юм і інш.). Ён зыходзіць не з проціпастаўлення матэрыяльнай і духоўнай субстанцый, а з проціпастаўлення пазнаючага суб'екта пазнавальнаму аб'ек-

ту, што вядзе да абсалютызацыі свядомасці і яе адрыву ад сваёй матэрыяльнай асновы. Панясце «Д.» сустракаецца ў разнастайных маральных, эстэт., паліт. і інш. канцэпцыях, дзе аб'ядноўваюцца несумяшчальныя пачаткі (дабро і зло, прыгожае і агіднае і інш.). *В.І.Боўш.*

ДУБ (Quercus), род кветкавых раслін сям. букавых. Каля 600 відаў; адна з гал. лесаўтваральных парод. Пашыраны пераважна ў Паўн. паўшар'і і гарах Паўд. Амерыкі. На Беларусі 2 дзікарослыя і 13 інтрадукаваных відаў. Д. звычайны, або летні, ці чарэшчаты (Q. robur), расце ўсюды, асабліва на Пд, утварае *дубовыя лясы*; асобныя дрэвы ахоўваюцца як помнікі прыроды. Д. скальны, або зімовы, ці сядзячакветны (Q. petraea) — атлантычна-еўрап. рэліктавы від, трапляецца рэдка (вядома адзінае месца росту на тэр. нац. парку «Белавежская пушча», дзе ён утварае чыстыя і мяшаныя з грабам і елкай насаджэнні), занесены ў Чырв. кнігу Беларусі. Сярод інтрадукаваных найб. вядомыя Д. балотны (Q. palustris), паўночны (Q. borealis), каштаналісты (Q. castanefolia), шарлахавы (Q. coccinea), грузінскі (Q. iberica), буйнапыльнікавы (Q. macranthera), аксамітны (Q. velutina), мангольскі (Q. mongolica), Гартвіса (Q. hartwissiana).

Аднадомныя шматгадовазялёныя і лістападныя дрэвы і кусты з шатра- ці калонападобнай, пірамідальнай, ніцай або раскідзістай кронай. Жывуць 400—500, іншы раз да 2000 і больш гадоў. Лісце простае, чаргаванае, перыста-лопасцевае, суцэльнакрайняе, зубчастае, на чаранках. Кветкі дробныя, непрыкметныя, раздзельнаполыя, з зачаткавым какляветнікам. Плады — аднагнездавыя арэхі (жалуды), у ніжняй ч. з чашападобнай плоскай. Драўніна мае высокія фізіка-мех. і тэхн. ўласцівасці, прыгожую тэкстуру (асабліва цэніцца драўніна Д., якая доўга знаходзіцца пад вадой, т. зв. «мораны дуб»); выкарыстоўваецца ў мэблевай і сталярнай вытв-сці, вагона-, авія- і суднабудаванні, буд-ве і інш. Кара мае да 12% танінаў, добры дубільнік і вяжучы сродак, ідзе на выраб коркаў, жалуды — на прыгатаванне сурагату кавы, а таксама на корм жывёле. Дэкар. віды Д. выкарыстоўваюць у зялёным буд-ве. *Г.У.Вынаеў.*

ДУБ, возера ў Гродзенскім р-не, у бас. р. Нёман, за 37 км на ПнУ ад Гродна, на мяжы з Літвой. Пл. 0,35 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 350 м, даўж. берагавой лініі 3,3 км. Схілы катлавіны на Пн і З выш. 8—10 м (на Пд і У 2—3 м), параслі лесам і хмызняком, на Пд участкі разараныя. Дно выслана сапрапелем.

ДУБ, дубок, выдзеўбаная дубовая лодка, вял. *човен*. Рабілі пераважна ў бас. Дняпра і Прыпяці, дзе яны хадзілі да канца 19 ст. Памеры залежалі ад дыяметра ствала дрэва і прызначэння. Выкарыстоўваўся для перавозкі грузаў і людзей, рэгулявання сплаву лесу (плытоў), у якасці платформы для парома. Прыпяцкія Д. ў час разліву замянялі паромы, маглі перавозіць 2 параконныя вазы. З-за драпежнага вынішчэння гаёў у 2-й пал. 19 ст. рабілі дашчаныя Д. з хвоі і асіны. *Н.І.Буракоўская.*

ДУБАВЕ́ЦЬ Сяргей Іванавіч (н. 17.9.1959, г. Мазыр Гомельскай вобл.), бел. крытык, публіцыст, празаік. Скончыў БДУ (1984). Друкуецца з 1982. Працаваў у прэсе, у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя». З 1990 рэдактар газ. «Наша ніва». Аўтар зб. прозы, эсэ, крытыкі «Практыкаванні» (1992).

ДУБАВІ́ЦА, вёска ў Струкачоўскім с/с Кармянскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса. За 18 км на ПдЗ ад г.п. Карма, 128 км ад Гомеля, 78 км ад чыг. ст. Рагачоў. 424 ж., 121 двор (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДУ́БАЙ, курганны могільнік (7 — пач. 6 ст. да н.э.) *мілаградскай культуры* каля в. Дубай Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Больш за 80 насыпаў. Зафіксаваны незвычайны для мілаградскай культуры на тэр. Беларусі пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце галавой на ПдУ (1—3 нябожчыкі ў кургане), побач клалі інвентар, над магілай рабілі драўляную дамавіну, зверху насыпалі курган. Сярод знаходак жал. наканечнікі дзід, залатая завушніца, вял. грушападобныя пасудзіны. *С.Я.Расадзін.*

ДУБА́Й, Дыбай, горад у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, на ПнУ Аравійскага п-ва. Знаходзіцца на ўзбярэжжы Персідскага зал. Гал. горад эмірата Дубай. 265,7 тыс. ж., з прыгарадамі 510 тыс. ж. (1991). Вузел аўтадарог, гал. порт краіны. Міжнар. аэрапорт. Цэнтр раёна нафтаздабычы. Алюм. з-д, сухі док (буйнейшы ў свеце), прадпрыемствы па звадкаванні газу, аўтарамонтныя майстэрні. Ін-т нафты. Нац. б-ка.

ДУ́БАЙ, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., на р. Піна, на аўтадарозе Пінск—Брэст. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на З ад г. Пінск, 150 км ад Брэста, 11 км ад чыг. ст. Юхнавічы. 433 ж., 185 двароў (1997). Аддз. рыбгаса. Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнікі архітэктуры — *Дубайскі парк* і царква Раства Багародзіцы (1811).

ДУ́БАЙ, вёска ў Відзіборскім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса. За 24 км на Пн ад г. Столін, 272 км ад г. Брэст, 10 км ад чыг. ст. Відзібор. 1036 ж., 477 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — Мікалаеўская царква (1906). На ўскраіне вёскі археал. помнік *Дубай*.

ДУ́БАЙСКІ ПАРК, помнік садова-паркавага мастацтва. Створаны ў 2-й пал. 18 ст. ў в. Дубай Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Парк рэгулярнага тыпу сіметрычна-восевай планіроўкі. Пл. каля 5 га. У плане квадрат, абмежаваны каналамі. У цэнтры ўсх. канала быў круглы вадаём (дыяметр каля 30 м) з фантанамі (не зберагліся), па вуглах — прамавугольныя вадаёмы. Унутры парку сіметрычнай сістэмай каналаў і сажалак

Дуб звычайны.

створаны цэнтр. плошча і 2 астравы з паркавымі насадкамі і прамавугольнымі ўчасткамі пладовых садоў. У канцы 18 ст. цэнтр. плошча, на якой размяшчаліся 2-павярховы мураваны сядзібны дом (не збярогся) з партэрам перад ім, капліца і гасп. пабудовы, перапланавана ў пейзажным стылі. *В.Р.Анціпаў.*

Дубайскі парк. Схема планіроўкі.

ДУБА́С, да пач. 20 ст. драўлянае кругладнонае хадавое судна. Будавалі на рэках Зах. Буг і Мухавец. Даўж. 28—32 м, шыр. 7—8 м, грузападымальнасць ад 48—60 да 128—160 т. Служылі каля 5 навігацый.

ДУБАНО́С (Coccothraustes coccothraustes), птушка сям. ўюрковых атр. вераб'інападобных. Пашыраны ва ўмераных шыротах Еўразіі, на Пн Індыі і Афрыкі. Жыве ў лісцевых і мяшаных лясах, садах і парках. Пералётны, часткова зімуе. На Беларусі звычайны на Пд ад шыраты г. Бабруйск, найб. на Палессі; рэдкі на Пн.

Даўж. цела каля 13 см, маса 46—57 г. Дзюба моцная, тоўстая, канічная. Галава бура-карычневая, горла, паласа вакол дзюбы, крылы і хвост чорныя, спіна каштанавая, на плячах шырокая светлая паласа, цела знізу рыжавата-шэрае, брушка і пляма на хвасце і крылах белыя. Самка больш цьмяная. Нясе 3—7 (найчасцей 4—5) яец. Корміцца насеннем дрэў, пладамі крушыны, рабіны, чаромхі, костачкамі вішні і інш.

Дубанос.

ДУ́БАР Леанід Паўлавіч (18.8.1925, г. Магілёў — 18.2.1978), бел. жывапісец і графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1961). Выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы (з 1961). Сярод работ сюжэтна-тэматычныя карціны «Чацвёра адважных» (1961), «У дарозе» (1962), «Тарпедная атака» (1963), «Пагрузка мін» (1964), «Матросы» (1970), пейзажы «Каля прычала» (1963), «Блакітнае змярканне» (1965), «Шэры дзень» (1967). Працаваў у кніжнай графіцы, афармі кнігі «Шчаслівая дарога» А.Александровіча (1958), «Мсціслаўцаў посах» Э.Ялугіна (1971), «Па закліку сэрца» М.Аляксеева (1974), «Дзяўчына ішла па вайне» М.Гамолкі (1976). *А.Б.Александровіч.*

Л.Дубар. Матросы. 1970.

ДУБА́САЎ Мікалай Аляксандравіч (28.9.1869, С.-Пецярбург — 4.4.1935), рускі піяніст і педагог. Засл. дз. маст. Расіі (1923). Ігры на фп. вучыўся ў бацькі, выкладчыка Пецярбургскай кансерваторыі. Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1889), у 1894—1917 і 1923—35 выкладаў у ёй (праф. з 1902). Канцэртаваў у Расіі і за яе межамі. У 1918—20 праф. Саратаўскай, у 1921—23 — Віцебскай кансерваторый. Лаўрэат 1-га Міжнар. конкурсу піяністаў імя А.Рубінштэйна (1890).

ДУБАТО́ЎСКАЕ, біялагічны заказнік на тэр. Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Створаны як заказнік-журавіннік для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін на балоце верхавога тыпу Дубатоўка ў 1979. Пл. 720 га (1997). У заказніку 2 невял. возеры. Па краі балота пераважна асакова-пушыцава-сфагнавая раслінасць, бліжэй да цэнтра — асакова-пушыцава-кусцікавасфагнавая. На мінер. «астравах» у цэнтры трапляецца рэдкая ахоўная расліна — купальнік горны.

ДУ́БАЎ Георгій Савельевіч (9.12.1933, г. Чыта, Расія — 9.8.1995), беларускі акцёр. Нар. арт. Беларусі (1990). Скончыў

Г.**Дубаў** у ролі Жываты Цвіёвіча.

Бел. тэатр.-маст. ін-т (1958). З 1959 у Гродзенскім абл. драм. т-ры, з 1964 у Бел. т-ры імя Я.Коласа. Мастацтву Д. былі ўласцівы яркая характарнасць, камед. майстэрства, імправізацыйнасць. Акцёр дэталі, штрыха; імклівы, лёгкі, гарэзлівы і адначасова востры, удумлівы. Сярод лепшых роляў: Цярэшка Калабок («Трыбунал» А.Макаёнка), Жывата Цвіёвіч («Доктар філасофіі» Б.Нушыча), Стары («Шчаслівае здарэнне» С.Мрожака), жонка Журдэна («Здурнелы Журдэн» М.Булгакава), Дон Хуан («Многа шуму з нічога» У.Шэкспіра).

Г.С.Дубаў.

П.П.Дубашынскі.

ДУ́БАЎКА, рака ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна. Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 177 км^2. Пачынаецца за 1 км на З ад в. Клюшова. У верхнім цячэнні называецца Асеча. Цячэ ў межах Гарадоцкага ўзв. Асн. прыток р. Карляча (справа).

ДУБАЎСКО́Е ВО́ЗЕРА, у Ганцавіцкім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Цна, за 9 км на Пд ад г. Ганцавічы. Пл. 0,2 км^2, даўж. 620 м, найб. шыр. 380 м, даўж. берагавой лініі 1,6 км. Схілы катлавіны выш. да 5 м, пад лесам. Дно выслана сапрапелем.

ДУБАЎСКО́Й Мікалай Ніканоравіч (17.12.1859, г. Новачаркаск, Расія — 28.2.1918), рус. жывапісец-пейзажыст. Скончыў Пецярбургскую АМ (1881). Правадз. чл. Пецярбургскай АМ (1900; з 1911 праф. — кіраўнік пейзажнай майстэрні). З 1886 чл. Т-ва перасоўных маст. выставак (гл. *Перасоўнікі*), з 1890-х г. адзін з яго кіраўнікоў. Імкнуўся да эпічна-абагульненага адлюстравання прыроды («Дубы» і «Прыціхла», абодва 1890; «На Волзе», 1892; «Радзіма», каля 1903—05).

ДУ́БАХ Аляксандр Давідавіч (9.7.1883, в. Ботава Маскоўскай вобл. — 1942), бел. вучоны ў галіне меліярацыі і гідралогіі. Акад. АН БССР (1928), д-р с.-г. н. (1926), праф. (1921).Скончыў Маскоўскі с.-г. ін-т (1908). У 1908—16 інжынер-гідратэхнік у Мінскай і Магілёўскай губ. З 1920 заг. кафедры БСГА. У 1927—30 заг. аддзела Бел. НДІ сельскай і лясной гаспадаркі. У 1925—30 старшыня Навук.-тэхн. савета пры Наркамземе БССР. У 1927—42 заг. кафедры Ленінградскай лесатэхн. акадэміі. Распрацоўваў пытанні гідралогіі лясоў, балот, уплыву лесу на рачны сцёк. Зрабіў навук. аналіз заканамернасцей фарміравання воднага рэжыму балот.

ДУБАШЫ́НСКІ Павел Піліпавіч (н. 14.3.1931, в. Гарбуны Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл.), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1989). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1955). Працаваў у Бел. рэсп. т-ры юнага гледача, выконваў ролі маладых герояў, характарныя. З 1967

П.Дубашынскі ў ролі князя К.

М.Дубаўской. Прыціхла. 1890.

у Нац. акад. т-ры імя Я.Купалы. Акцёр яркага і самабытнага таленту, добра адчувае камедыйны жанр. Выкарыстоўвае прыёмы шаржу, пародыі, гратэску. Дасканалае майстэрства выявілася ў ролях: Камендант, Ломцеў («Трыбунал», «Таблетку пад язык» А.Макаёнка), Гастрыт («Вечар» А.Дударава), Дабрыян («Брама неўміручасці» К.Крапівы), Язэп Карыта («Ажаніцца — не журыцца» паводле Далецкіх і М.Чарота), князь К. («Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага), Глахуна («Закон вечнасці» паводле Н.Думбадзе), граф дэ Мірмон («Лесвіца славы» Э.Скрыба) і інш. Здымаецца ў кіна- і тэлефільмах.

ДУБЕ́ЙКАЎСКІ Лявон Іванавіч, гл. *Віткан-Дубейкаўскі* Л.І.

ДУ́БЕЛЬТ Лявонцій Васілевіч (1792, г. Магілёў — 9.5.1862), ваенны і дзярж. дзеяч, адзін з арганізатараў паліт. вышуку ў Расіі. Генерал ад кавалерыі (1856). Скончыў Горны кадэцкі корпус (1807), служыў у пяхоце (да 1830). Удзельнік кампаній 1807 і 1812—15, ад'ютант Дз.С.*Дахтурова*, М.М.*Раеўскага*. У пач. 1820-х г. масон. З 1830 у *Корпусе жандараў*, з 1835 нач. штаба корпуса. У 1839—56 адначасова кіраўнік *«Трэцяга аддзялення»*, чл. Гал. ўпраўлення цэнзуры і Сакрэтнага к-та аб раскольніках. Кіраваў праследаваннем паэтаў А.С.Пушкіна і М.А.Някрасава, расследаваў справы *Кірыла-Мяфодзіеўскага таварыства* і *петрашэўцаў*. З 1856 у адстаўцы.

Літ.: Оржеховский И.В. Самодержавие против революционной России (1826—1880 гг.). М., 1982.

ДУБІКО́ЎСКІ Георгій Пятровіч (н. 18.5.1934, г. Гродна), бел. вучоны ў галіне аграхіміі. Чл.-кар. АН Беларусі (1996), д-р с.-г. н. (1976), праф. (1987). Скончыў Гродзенскі с.-г. ін-т (1957). З 1962 у БДУ, з 1969 у Бел. НДІ глебазнаўства і аграхіміі, з 1982 у Гродзенскім с.-г. ін-це. Навук. працы па біягеахіміі і матэм. мадэляванні заканамернасцей размеркавання мікраэлементаў у глебах, распрацоўцы навук. асноў жыўлення раслін мікраэлементамі,

Г.П.Дубікоўскі.

прыёмаў экалагічнага (альтэрнатыўнага) земляробства, арганізацыі вытв-сці на Беларусі прамысл. формаў мікраўгнаенняў (калійна-медных, азотна-цынкавых і інш.), пытаннях мед. геаграфіі, аховы навакольнага асяроддзя.

Тв.: Микроэлементы в почвах СССР. М., 1981 (у сааўт.).

ДУБІ́ЛЬНЫЯ РАСЛІ́НЫ, расліны, якія маюць *дубільныя рэчывы* (таніны) у колькасцях, дастатковых для прамысл. атрымання дубільных экстрактаў. Падзяляюцца на высока- (больш за 20%), сярэдне- (12—20%) і нізкатанінныя (менш як 12%). На Беларусі асн. Д.р. — дуб (у кары і драўніне 5—15% танінаў, выкарыстоўваецца ў дубільна-экстрактавай прам-сці), елка, розныя віды вербаў і інш.

Па месцы канцэнтрацыі танінаў у расліне адрозніваюць Д.р.: коравыя — дуб, елка, лістоўніца, вярба; лісцевыя — скумпія, бадан, герані, вятроўнік; драўнінныя — дуб, каштан; пладовыя — дуб; каранёвыя — драсён, шчаўе, рэвень; галавыя — дуб, вярба і інш.

ДУБІ́ЛЬНЫЯ РЭ́ЧЫВЫ, дубільнікі, рэчывы, якія выкарыстоўваюць для *дублення* скуры і футра. Паводле хім. прыроды адрозніваюць мінеральныя і арганічныя.

Мінеральныя Д.р. — солі хрому, алюмінію, цырконію, жалеза, тытану і інш. Выкарыстоўваюць пераважна злучэнні Cr(III) (хромавае дубленне), у асн. гідраксасолі (напр., гідраксід-сульфат $CrOHSO_4$) ці камбінацыі іх з інш. дубільнікамі. Злучэнні цырконію (напр., сульфатацырканат натрыю $Na_4Zr(SO_4)_4$) павышаюць вода- і зносаўстойлівасць скуры, робяць гладкім і шчыльным вонкавы бок. Арганічныя Д.р. падзяляюцца на простыя — альдэгіды (напр., фармальдэгід, глутаравы альдэгід), тлушчы рыб і марскіх жывёл (ворвань), і складаныя — раслінныя рэчывы (*таніны*), сінт. Д.р. і палімеры. Ворвані выкарыстоўваюць для вырабу натуральнай замшы (тлушчавае дубленне). Таніны атрымліваюць у выглядзе водных экстрактаў з кары, драўніны, лісця і пладоў некаторых раслін (дуба, вярбы, елкі, лістоўніцы, бадану і інш.). Чыста танінавае дубленне выкарыстоўваюць рэдка з-за працягласці працэсу. Замяняюць таніны і паскараюць працэс дублення сінт. Д.р. (напр., прадукты полікандэнсацыі рэзарцыну з фармальдэгідам). Палімерныя дубільнікі (напр., нізкамалекулярныя метылметакрылат і этылакрылат, карбаміда-, меламіна-, фенолфармальдэгідныя смолы і інш.). У камбінацыі з інш. Д.р. дазваляюць вырабляць скуры з паніжанай водапранікальнасцю. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ДУБІ́НА Антон Васілевіч (16.1.1885, г. Веліж, Расія — 30.10.1937), дзяржаўны дзеяч БССР. З 1902 працаваў тэлеграфістам. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07, 1-й сусв. вайны. З 1918 у Чырв. Арміі. Ваен. камісар Ігуменскага, Мінскага пав., ваен. камендант Мінска, гомельскі губ. ваен. камісар. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Ваенком 2-й стралк. і 7-й кав. дывізій, нам. наркома, нарком па ваен. справах БССР. З 1925 старшыня Магілёўскага акр. выканкома, упаўнаважаны Наркамата сувязі СССР па БССР, старшыня ЦК Асаавіяхіма БССР. Чл. ЦК КП(б)Б з 1925. Чл. ЦВК БССР у 1920—21, 1924—37, канд. у чл. ЦВК СССР у 1925—29.

ДУБІНА́-БАЯ́РСКАЯ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр Узбалацкага с/с і калгаса. За 10 км на Пн ад горада і чыг. ст. Валожын, 80 км ад Мінска. 277 ж., 112 двароў (1997). Базавая школа, б-ка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Свята-Георгіеўская царква (1868).

ДУБІ́НІН Мікалай Пятровіч (н. 4.1.1907, г. Кранштат Ленінградскай вобл., Расія), савецкі генетык. Акад. АН СССР (1966; чл.-кар. 1946). Чл. шэрагу замежных АН. Скончыў Маскоўскі ун-т (1928). З 1932 працаваў у шэрагу н.-д. устаноў АН СССР, у 1966—81 дырэктар Ін-та агульнай генетыкі АН СССР. Адкрыў (разам з А.С.*Сераброўскім*) падзельнасць гена. Даследаваў эфект становішча гена, пытанні генетыкі папуляцый. Навук. працы па эвалюцыйнай, радыяцыйнай і касм. генетыцы, тэарэт. асновах селекцыі. Ленінская прэмія 1966.

Тв.: Общая генетика. М., 1970.

ДУБІ́НІН Міхаіл Міхайлавіч (1.1.1901, Масква—1993), расійскі фізікахімік. Акад. Рас. АН (1943), Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1921), у ім і працаваў. У 1932—55 у Ваен. акадэміі хім. абароны, з 1946 у Ін-це фіз. хіміі Рас. АН. Навук. працы па фіз. хіміі паверхневых з'яў, тэорыі і тэхналогіі сарбцыйных працэсаў. Распрацаваў метады атрымання высокаэфектыўных прэпаратаў актываванага вугалю і адсарбентаў з зададзенымі параметрамі сітаватасці. Стварыў агульную тэорыю дынамікі сорбцыі і класіфікацыю структурных тыпаў паглынальнікаў. Дзярж. прэмія СССР 1942, 1950.

Літ.: М. М. Дубинин. 2 изд. М., 1981.

ДУБІ́НКА Вячаслаў Андрэевіч (н. 17.12.1941, г. Слуцк Мінскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Чарнавіцкі тэхнікум чыг. транспарту (1961). Працаваў на будоўлі, фотакарэспандэнтам. З 1981 у час. «Беларусь». Аўтар фотанарысаў, апавяданняў, публіцыст. артыкулаў, эсэ, фотаальбомаў «Бабруйск» (1968), «Нясвіж» (1968), «Магілёў» (1971), «Брэст» (2 выд., 1979), кніг прозы і публіцыстыкі «Паплач ля роднае крыніцы» (1981), «Не плач, душа мая» і «Ой, зялёны дубочак...» (1983), «Браты святой ночы» (1986), «Развітальная песня» (1989), «Сіндыкат Мані Дулі» (1992). Зрабіў літ. запіс дакумент. аповесці П.Ратайкі «На жыццёвых кручах» (1985). Майстар выцінанак.

ДУБІ́ННАЯ ВАЙНА́, антыфеадальнае паўстанне фінскіх сялян у 1596—97. Гл. раздзел Гісторыя ў арт. *Фінляндыя*.

ДУБІНО́ЎСКІ Лазар Ісаакавіч (1.5.1910, г. Фалешты, Малдова — 29.11.1982), малдаўскі скульптар. Нар. маст. Малдовы (1963). Чл.-кар. АМ СССР (з 1954). Вучыўся ў АМ у Бухарэсце (1925—30). Яго работы вызначаюцца дынамікай, эмацыянальнасцю. Аўтар партрэтаў рум. мастака К.Бабы, Хо Шы Міна (Дзярж. прэмія Малдавіі 1970), помнікаў Р.Катоўскаму, «Гераічнаму камсамолу» ў Кішынёве, станковых кампазіцый (трылогія «Бацькі і дзеці», 1957, «Ціраспальскія швачкі», 1962) і інш.

ДУБІ́НСКІ Сяргей Антонавіч [13(25).10.1884, в. Наройкі Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер у Бельскападляскім ваяв., Польшча — 27.8.1937], бел. археолаг. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1914). Працаваў настаўнікам. З 1925 чл. гіст.-археал. камісіі, з 1928 навук. супрацоўнік Інбелкульта, з 1929 у Ін-це гісторыі АН БССР, з 1933 у Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (Ленінград). Даследаваў помнікі раняга жал. веку і эпохі сярэдневякоўя, курганныя старажытнасці ў Бельскім пав., гарадзішчы і могільнікі на Бабруйшчыне, Віцебшчыне, Магілёўшчыне, Мазыршчыне, Міншчыне. У 1926—28 вывучаў гарадзішчы Банцараўшчына і Чаркасова. Склаў і выдаў першую «Бібліяграфію па археалогіі Беларусі і сумежных краін» (1933), у якую ўключыў працы па дакласавым грамадстве, раннім феадалізме, нумізматыцы, сфрагістыцы, архітэктуры абарончых збудаванняў. Беспадстаўна рэпрэсіраваны ў 1937, рэабілітаваны ў 1958.

Літ.: Каробушкіна Т.М. Археолаг С.А.Дубінскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1986. № 4. *Т.М.Каробушкіна.*

Л.**Дубіноўскі**. Ціраспальскія швачкі. 1962.

ДУБІ́ЦКІЯ, бел. размалёўшчыкі шкла. У 2-й пал. 18 ст. працавалі на шклагутах Радзівілаў.

Мікалай (?—1794). Працаваў на гуце ў Налібаках, з 1739 ва Урэччы. Быў першым размалёўшчыкам па шкле, ствараў эскізы люстэркаў. У 1775—81 працаваў на мануфактуры Хадкевічаў у Чарнобылі, потым ізноў ва Урэччы. Гравіраваў узоры на шкляных пластах і рамах для люстэркаў, аздабляў дробную шкляную пластыку.

Ян (?—?), відаць, сын Мікалая. Да 1744 і пасля 1750 працаваў у Налібаках, паміж імі — ва Урэччы. Быў памочнікам Мікалая, потым першым мастаком. Аздабляў келіхі манаграмамі і гербамі, келіхі накшталт «флейтаў» — гравіраванымі арламі і сардэчкамі, бутэлькі — вайсковай атрыбутыкай і ініцыяламі,

уплеценымі ў выцягнуты арнамент. У 1781 дэкарыраваў 190 шкляных прыбораў для Радзівіла (Мацея ?), у 1781—84 аздобіў прыборы для караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, у т.л. келіх з каралеўскім гербам і манаграмай. У 1784—85 стварыў набор шклянак з гравіраванымі яўр. літарамі.

Літ.: Яніцкая М.М. Беларускае мастацкае шкло (XVI—XVIII стст.). Мн., 1977.

І.М.Каранеўская.

А.І.Дубко.

ДУБКО́ Аляксандр Іосіфавіч (н. 14.1.1938, в. Ілава Шумілінскага р-на Віцебскай вобл.), дзяржаўны дзеяч Беларусі. Герой Сац. Працы (1982). З 1960 працаваў аграномам-насенняводам, кіраўніком аддзялення, дырэктарам вучэбнай гаспадаркі «Станіславова» Гродзенскага с.-г. ін-та. У 1966—70 нач. управлення сельскай гаспадаркі Бераставіцкага райвыканкома, у 1970—72 дырэктар трэста малочна-гароднінных саўгасаў Гродзенскай вобл., у 1972—94 старшыня калгаса, старшыня савета с.-г. калект. прадпрыемства «Прагрэс» Гродзенскага р-на. Са снеж. 1994 старшыня Гродзенскага аблвыканкома. З 1990 старшыня Саюза аграрнікаў Беларусі.

ДУБКО́ВА Тамара Аляксандраўна (н. 13.1.1936, г. Полацк Віцебскай вобл.), бел. музыказнавец. Засл. дз. маст. Беларусі (1992). Скончыла Бел. кансерваторыю па класах тэорыі музыкі (1958) і фп. (1959). У 1959—92 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Займаецца распрацоўкай тэарэт. праблем прафес. і нар. бел. музыкі. Мае значныя дасягненні ў даследаванні нац. сімфанізму. Выступае як муз. крытык. Аўтар сцэнарыяў фільма «Жыцця вымярэнні» (1983), фільма-оперы «У пушчах Палесся» А.Багатырова (1984), шматлікіх радыё- і тэлеперадач.

Тв.: Анатоль Багатыроў. Мн., 1972; Беларуская сімфонія. Мн., 1974; Некаторыя пытанні развіцця беларускай эстэтыкі і музычнай крытыкі // Музыка нашых дзён. Мн., 1974; Балады: [укладанне муз. часткі, камент. і ўступны арт.]. Кн. 1—2. Мн., 1977—78 (Бел. нар. творчасць); Некаторыя тэндэнцыі фарміравання жанру сімфоніі ў сучаснай беларускай музыцы // Мастак і сучаснасць. Мн., 1980; Музычны тэатр Беларусі. [Кн. 2, 4]. Мн., 1993, 1997 (у сааўт.).

ДУБЛЁННЕ, 1) адзін з асн. працэсаў пры вырабе скуры і футра. У *гарбарнай прамысловасці* — для надання паўфабрыкату скуры з дапамогай *дубільных рэчываў* пластычнасці, трываласці, устойлівасці да зносу і інш.; пры вырабе футра — для замацавання стану скур пасля *пікелявання*. Пры Д. ўтвараюцца хім. сувязі паміж бялком (калагенам) дэрмы або валасоў і малекуламі дубільнага рэчыва. У выніку адбываюцца неабарачальныя змены якасцей дэрмы або валасоў. Д. садзейнічае павышэнню тэмпературы зварвання паўфабрыкату, памяншэнню ўсадкі аб'ёму пры высушванні, набракання ў вадзе, павелічэнню порыстасці пасля сушкі, трываласці скуры на разрыў у набраклым стане і ўстойлівасці да ўздзеяння ферментаў і розных гідралізуючых агентаў. Д. паляпшае якасць валасоў (пругкасць, змочвальнасць і інш.). 2) У ф а т а г р а ф і і — хім. апрацоўка святлоадчувальных жэлацінавых слаёў фотаматэрыялаў з мэтай павелічэння іх мех. трываласці, тэрмаўстойлівасці і памяншэння ступені іх набракання ў вадзе і водных растворах. Для гэтага ў эмульсію дадаюць неарганічныя (хрома- ці алюмакаліевыя галыны, воцатнакіслы хром) і арган. (фармалін, гліаксаль і інш.) рэчывы.

ДУБЛЕ́Т (франц. doublet ад double двайны), 1) адзін з 2 аднолькавых прадметаў; другі экзэмпляр якой-н. рэчы ў калекцыі, музеі, б-цы і інш. 2) Падроблены каштоўны камень, склеены з 2 частак, з якіх толькі верхняя з'яўляецца сапраўднай. 3) 2 выстралы запар па адной цэлі з двухствольнага ружжа. 4) У м у з ы ц ы — падвойны рэгістр у арга-не.

ДУБЛЁР (франц. doubleur ад doubler падвойваць), 1) той, хто паралельна з кім-н. выконвае аднолькавую работу (напр., прадпрыемства-Д., Д. касманаўта — які праходзіць разам з ім падрыхтоўку і здольны яго замяніць). 2) Акцёр, які замяняе асн. выканаўцу ролі, а таксама акцёр, які ўзнаўляе тэкст пры перакладзе фільма з адной мовы на другую.

ДУБЛІКА́Т (ад лац. duplicatus падвоены), другі экзэмпляр дакумента, які мае аднолькавую юрыд. сілу з арыгіналам.

ДУ́БЛІН (Dublin; ірл. Б а л е - А х а - К л і я х), горад, сталіца Ірландыі. Размешчаны на У краіны, у вусці р. Ліфі, якая ўпадае ў зал. Дублін Ірландскага м. 915,5 тыс. ж. (1991). Вузел чыгунак і аўтадарог, гал. марскі порт. Каналамі Роял і Гранд злучаны з унутр. раёнамі. Міжнар. аэрапорт. Гал. эканам. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: машынабудаванне (эл.-тэхн. і радыёэлектроннае, прылада- і трактарабудаванне, суднабудаванне і суднарамонт, с.-г.), металаапр., харчасмакавая (піваварная, мясаканцервавая, бяконная, мукамольная, тытунёвая, вытв-сць віскі), тэкст. (шарсцяная і льняная), швейная, джутавая, буд. матэрыялаў. Дублінскі ун-т, Нац. ун-т, АН і Акадэмія мастацтваў. Тэатры. Штогадовы міжнар. Дублінскі тэатр. фестываль (з 1948).

Паходзіць ад стараж. назвы ўчастка р. Ліфі (Dubhlin — чорная затока). Упершыню ўпамінаецца пад 291. У 9 ст. заваяваны нарманамі, якіх паступова асімілявалі ірландцы. У 1170 захоплены англ. феадаламі, з канца 12 ст. цэнтр заваяванай імі калоніі. Гар. права з 1171. У 1613—1800 месца знаходжання ірл. парламента. З 17 ст. Д. — адзін з цэнтраў ірл. вызв. руху. У Д. адбылося *Ірландскае паўстанне 1916.* У 1919 тут засядаў Ірл. парламент, які абвясціў незалежнасць Ірландыі. Паводле англа-ірл. дагавора 1921 з Д. выведзены англ. гарнізон, горад стаў сталіцай Ірландскай вольнай дзяржавы, з 1949 — Ірландскай рэспублікі.

Са стараж. забудовы захаваліся замак (зараз Палац юстыцыі; 13 ст.), гатычныя царква Крайст-чэрч (1038—1225) і сабор Сент-Патрык (1190, перабудаваны пасля 1362). З 1757

Дублін. Вуліца О'Конел-стрыт.

перапланаваны цэнтр, дзе склаліся парадныя ансамблі ў стылі класіцызму. Парламент (1745—48), Трыніты-каледж (зараз ун-т; фасад — 1759), Чарлімант-хаўс (зараз Галерэя сучаснага мастацтва; 1763—70, арх. У.Чэймберс), ратуша (б. біржа; 1769, арх. Т.Кулі), Ірл. банк (1729—1805); будынкі «Чатырох судоў» (1786—1800), царква Сент-Джордж (1794—1802). У 1913 складзены план рэканструкцыі Д. (арх. П.Аберкрамбі); пабудаваны аэравакзал (1937—41), аўтавакзал (1951—53), шэраг жылых і прамысл. комплексаў. Музеі: Нац. музей, Нац. галерэя, Муніцыпальная галерэя сучаснага мастацтва, Грамадзянскі музей.

ДУ́БЛІН, вёска ў Брагінскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр Спярыжскага с/с і калгаса. За 6 км на ПдУ ад Брагіна, 125 км ад Гомеля, 34 км ад чыг. ст. Хойнікі. 372 ж., 144 двары (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ДУ́БЛІНСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1916, гл. *Ірландскае паўстанне 1916.*

ДУ́БЛІНСКІ РУ́КАПІС, лацінскі зборнік 2-й пал. 13 ст. Уключае розныя творы на лац. мове: вершы, пропаведзі, дыдактычныя трактаты, запавет св. Францыска, прароцтвы Іахіма Флорскага, кароткі ірландскі летапіс, даведзены да 1174, і інш. У пачатку змешчана «Апісанне зямель» — невял. геагр. трактат 3-й чвэрці 13 ст. невядомага аўтара, каталіцкага місіянера, які прапаведаваў у Прыбалтыцы сярод язычнікаў у часы Міндоўга. У ім даецца кароткае геагр. апісанне тагачаснай Еўропы, месцазнаходжанне розных краін, зямель і інш. Трактат — храналагічна самая ранняя гіст. крыніца, у якой упершыню згадваецца *Белая Русь* (Alba Russia). Паводле кантэксту твора, аўтар меў на ўвазе сумежную з Літвой і Латгаліяй зах. частку тагачаснай Русі, г. зн. тэр. сучаснай Усх. Беларусі. Помнік адкрыў і ўпершыню апублікаваў у арыгінале амер. вучоны М.Колкер. Захоўваецца ў б-цы Англіканскага ун-та ў Дубліне (Ірландыя). Бел. пераклад апублікаваны ў час. «Спадчына» (1993, № 6).

В.А.Чамярыцкі.

ДУБЛІ́РАВАННЕ, 1) выкананне паралельна з кім-н. аднолькавай (падобнай) работы; паўтарэнне, выкананне чаго-н. у 2 экзэмплярах. 2) Д. тэкстыльных матэрыялаў — здвойванне і змацаванне матэрыялаў з дапамогай нітачных строчак ці клею (напр., склейванне 2 розных тканін) або пад ціскам пасля аплаўлення паверхні аднаго з матэрыялаў (напр., змацаванне паралону з тканінай ці трыкатажам). 3) Д. фільма, дубляж — узнаўленне моўнай ч. гукавога кінафільма на інш. мове з сінхранізацыяй рухаў губ акцёра на экране і дублёра.

ДУБЛО́Н (франц. doublon ад ісп. doblon), іспанская залатая манета. Змяшчала каля 7,5 г золата. У 1537 выпушчаны *эскуда*, двайны эскуда называўся *пістоль*, або «іспанскі Д.». У еўрап. гандлі двайны пістоль атрымаў назву Д. Існаваў да 1868. Д. з'яўляўся стараж. залатой манетай Швейцарыі, у 15—16 ст. яго чаканілі рым. папы.

ДУБЛЯ́НСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, у Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл., за 28 км на З ад г. Масты, каля в. Дубляны. Створана ў даліне р. Верацейка ў 1984. Пл. 0,5 км^2, даўж. 900 м, найб. шыр. 600 м, найб. глыб. 5 м, аб'ём вады 1,37 млн. м^3. Наліўное. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 2,5 м. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель, рыбаводства, рэкрэацыі.

ДУБНА́, горад у Расіі, у Маскоўскай вобл., на р. Волга, пры ўпадзенні р. Дубна. Засн. ў 1956. 67,4 тыс. ж. (1992). 2 чыг. станцыі. Іванькаўская ГЭС. Каля Д. пачынаецца канал імя Масквы. Філіял НДІ ядз. фізікі Маскоўскага ун-та, філіял Маскоўскага ін-та радыётэхнікі, электронікі і аўтаматыкі. Аб'яднаны ін-т ядз. даследаванняў, засн. ў 1956 на падставе пагаднення, падпісанага 10 краінамі-заснавальнікамі (мэтай стварэння ін-та было ажыццяўленне супольных тэарэт. і эксперым. прац у галіне фізікі высокіх энергій; ін-т мае сінхрацыклатрон і сінхрафазатрон).

ДУ́БНА, вёска ў Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Нёман, каля аўтадарогі Масты—Скідзель. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 14 км на ПнЗ ад Мастоў, 48 км ад Гродна, 10 км ад чыг. ст. Чарлёна. 1058 ж., 424 двары (1997). Мясаперапрацоўчы камбінат. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Царква.

ДУ́БНІК, балота на ПдУ Пінскага р-на Брэсцкай вобл., у вадазборы р. Стыр. Нізіннага тыпу. Пл. 7,6 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 5,8 тыс. га. Глыб. торфу да 3,8 м, сярэдняя 1,2 м. Балота ў натуральным стане. Растуць асокі, ёсць хмызнякі з вярбы. Часткова выкарыстоўваецца пад сенажаць. Паўн. ч. балота асушаецца.

ДУБНО́Ў Сямён Маркавіч (10.10.1860, г. Мсціслаў Магілёўскай вобл. — снеж. 1941), яўрэйскі гісторык, публіцыст і грамадскі дзеяч. У 1880—1906 жыў у Пецярбургу, Адэсе, Вільні. З 1882 супрацоўнік час. «Восход» для яўрэйскай інтэлігенцыі. З 1906 лектар Вольнага ун-та Лесгафта ў Пецярбургу, на курсах усходазнаўства. У 1909—18 рэдактар час. «Еврейская старина». З 1917 праф. Пецярбургскага, з 1919 Яўр. ун-таў. З пач. 1920-х г. у Літве, Германіі, Латвіі. Забіты фашыстамі ў рыжскім гета. Аўтар даследаванняў па сусветнай гісторыі яўрэяў. Сабраў і апублікаваў шмат дакументаў, пераважна па гісторыі бел. яўрэяў. Даў новую перыядызацыю гісторыі яўр. народа, паклаў пачатак сацыялагічнага падыходу ў вывучэнні гісторыі яўрэяў.

Тв.: Учебник еврейской истории для еврейского юношества. Ч. 1—3. Одесса, 1898—1901; Краткая история евреев: Учеб. евр. истории: Для школы и самообразования. Ч. 1—3. СПб., 1912; Всемирная история еврейского народа от древнейших времен до настоящего времени. Т. 1—10. Рига, 1934—38. *Э.Р.Іофе.*

ДУБНЯКІ́, тое, што *дубовыя лясы.*

ДУБО́ВІК, грыб, тое, што *каштанавік.*

ДУБО́ВІК Сямён Андрэевіч (парт. псеўд. Андрэй, Старый, Балюк; 16.2.1888, в. Нароўшчына Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. — 28.10.1937), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. У 1909 эміграваў у ЗША, у 1911 за рэв. дзейнасць высланы адтуль, вярнуўся ў Расію. Не раз быў арыштаваны царскімі ўладамі. У грамадз. вайну нач. аддзела забеспячэння 2-й Укр. брыгады. З 1921 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі. Адзін з заснавальнікаў КПЗБ, удзельнік яе 1-й канферэнцыі (кастр. 1923). У 1923—24 сакратар Брэсцкага акругкома КПЗБ. У 1924 арыштаваны польск. ўладамі, прыгавораны да 4 гадоў турмы. З 1928 у апараце ЦК КПЗБ. З 1930 у СССР, працаваў пры Прадстаўніцтве ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. У 1937 арыштаваны органамі НКУС і прыгавораны Асобай нарадай да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957.

В.П.Ласковіч.

ДУБО́ВІК Уладзімір Аляксандравіч (7.7.1903, в. Немча Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 28.9.1987), генерал-лейтэнант (1959). У Чырв. Арміі з 1919. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). Удзельнік грамадз. вайны на Паўд. фронце, да 1940 у Генштабе РСЧА, потым у Забайкальскай ваен. акрузе. У Вял. Айч. вайну на фронце з крас. 1944, камандзір дывізіі. Удзельнік вайны з Японіяй. Да 1968 у Сав. Арміі, на розных пасадах у ваен. ВНУ, Генштабе Узбр. Сіл СССР, ваен. аташэ, узначальваў дэлегацыю СССР пры Ваенна-штабным к-це ААН.

ДУБО́ВІЧ Іван (? — 1646), бел. і ўкр. пісьменнік, грамадскі і царк. дзеяч. Прыхільнік уніі. У палемічных творах «Пра вярхоўную ўладу ў царкве божай» (Львоў, 1644), «Правільны каляндар» (Вільня, 1644) шырока выкарыстоўваў бел.-літ. і ўкр. летапісы, маскоўскія хронікі, зах.-еўрап. літ. крыніцы. Высока ацэньваў каляндарна-астранамічныя даследаванні М.Каперніка, разам з тым адмаўляў яго геліяцэнтрычную тэорыю.

Літ.: Харламповичъ К.В. Западнорусские православные школы XVI і начала XVII века... Казань, 1898; Далматовъ Н. Супрасльскій Благовѣщенскій монастырь. СПб., 1892. *Г.Я.Галенчанка.*

ДУБО́ВЫЯ ЛЯСЫ́, дубровы, дубнякі (Quercus), група фармацыйных карэнных шыракалістых лясоў, аснову дрэвастою якіх складаюць віды з роду *дуб*. Пашыраны ў Еўропе, Усх. Азіі, на Д.Усходзе, у Паўн. і Паўд. Амерыцы, пераважна ў горных і перадгорных раёнах. У Зах., Цэнтр. і Усх. Еўропе Д.л. створаны пераважна дубам звычайным, або летнім (Q. robur), і скальным, або зімовым (Q. petraea), у Паўд. Еўропе і Міжземнамор'і — каменным (Q. ilex) і коркавым (Q. suber), на Каўказе — грузінскім (Q. iberica), ва Усх. Азіі і на

Д.Усходзе — зубчастым (Q. dentata) і мангольскім (Q. mongolica), у Паўн. Амерыцы — чырвоным (Q. rubra), паўночным (Q. borealis) і балотным (Q. palustris). На Беларусі дрэвастоі Д.л. складаюцца ў асноўным з дубу звычайнага — чыстыя і з дамешкам ясеню, клёну, грабу, ліпы, ільмы, хвоі, елкі, бярозы, асіны, вольхі чорнай, часта з выразным 2-м ярусам. Яны займаюць 4% агульнай плошчы лясоў. Найб. пашыраны ў паўд., зах. і цэнтр. раёнах. Пашырэнне Д.л. і іх фітацэнатычная структура маюць выразныя занальныя асаблівасці. Вылучаюць 3 геабат. падзоны ў напрамку з Пн на Пд: яловых, ялова-грабавых і грабавых дуброў. Пераважаюць кандамінантныя фітацэнозы: у цэнтр. ч. — ялова-дубова-грабавыя, на Пд — дубова-грабавыя, хваёва-дубова-грабавыя, ясянёва-дубова-грабавыя, ліпава-клянова-дубова-грабавыя. Найб. пашыраныя тыпы Д.л.: кіслічныя, чарнічныя, арляковыя, сніткавыя,

Дубовы лес злакавы.

поймавыя, вострыцавыя, папарацевыя, крапіўныя. Сярэдні ўзрост 40 гадоў. Д.л. маюць важнае прыродаахоўнае, сан.-гігіенічнае і эстэт. значэнне, даюць высакаякасную драўніну для розных галін прам-сці. *Г.У.Вынаеў.*

ДУБО́ВЫЯ ШАЎКАПРА́ДЫ (Antheraea), род матылёў сям. паўлінавочак атр. лускакрылых. 2 віды: кітайскі Д.ш. (A. pernyi) і японскі Д.ш. (A. jamamai). На Д. Усходзе трапляецца яго падвід (A. j. ussuriensis). Культывуюць у Кітаі, Японіі, Карэі, Індыі, Расіі, Беларусі і інш. для атрымання прыроднага шоўку. Добра акліматызуюцца.

Да арт. **Дубовыя шаўкапрады**. Кітайскі дубовы шаўкапрад: 1 — кокан; 2 — вусень; 3 — матыль.

Крылы ў размаху 10—15 см. Вусені звіваюць *коканы*. Пры размотванні аднаго кокана атрымліваюць шаўковую нітку даўж. 1,5—5 км. За год даюць 1—2 пакаленні. Вусеняў выкормліваюць лісцем розных відаў дубу (у эксперыменце на бярозе, вярбе, грабе). У адрозненне ад *тутавага шаўкапрада* шоўк кітайскага Д.ш. больш грубы і моцны; выкарыстоўваюць на выраб часучы, у прыладабудаванні, электратэхніцы, медыцыне.

ДУБО́К, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна, за 10 км на ПнЗ ад г. Полацк. Пл. 0,38 км^2, даўж. 1,1 км, найб. шыр. 420 м, найб. глыб. 7 м, даўж. берагавой лініі 3,3 км. Пл. вадазбору 1,5 км^2. Схілы катлавіны выш. да 5 м, парослыя лесам. 2 залівы на З. Берагі нізкія, месцамі сплавінныя, забалочаныя, пад хмызняком. Дно выслана сапрапелем, на У мелкаводдзе пясчанае. Зарастае. На ПнУ з возера выцякае ручай у р. Полюшка.

ДУБО́ЎКА Уладзімір Мікалаевіч (15.7.1900, в. Агароднікі Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. — 20.3.1976), бел. паэт, празаік, перакладчык. Скончыў Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю (1918), Вышэйшы літ.-маст. ін-т імя В.Брусава (1924). У 1922—25 адказны сакратар пастпрэдства БССР пры Урадзе СССР. У 1924—27 выкладчык бел. л-ры ў Камуніст. ун-це народаў Захаду, у 1926—30 рэдактар «Збору законаў і загадаў Рабоча-Сялянскага ўраду Саюза ССР». У 1930 арыштаваны і асуджаны на высылку ў Яранск, у 1937 — на 10 гадоў пазбаўлення волі. Пакаранне адбываў у Кіраўскай вобл., Чувашыі, на Д.Усходзе, у Грузіі, Краснаярскім краі. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся з 1921. Аўтар зб-каў вершаў «Строма» (1923), «Трысцё» (1925), «Credo» (1926), «Наля» (1927), паэм «Там, дзе кіпарысы» (1925), «Браніслава» (1929). Паэзія Д. выраслa на здабытках бел. фальклору, традыцыях Я.Купалы, М.Багдановіча, Т.Шаўчэнкі, А.Блока, В.Брусава і інш. Яна вызначаецца ўслаўленнем чалавека працы, патрыят. пафасам, увагай да гераічных старонак нац. гісторыі, актыўнасцю маст. пошукаў, высокай творчай культурай (вобразная асацыятыўнасць, глыбіня падтэксту, дасканаласць гукавой інструментоўкі, рытмічная гнуткасць, багацце рыфмы, моўная вынаходлівасць). Яго паэзія пашырыла выяўленчыя магчымасці бел. вершаванага слова, узбагаціла рамант. стылявую плынь у л-ры свайго часу. Філас. заглыбленасць, складаная сюжэтна-кампазіц. структура ўласцівы яго трылогіі (паэмы «Кругі», 1927; «І пурпуровых ветразей узвівы», 1929; «Штурмуйце будучыні аванпосты!», нап. 1929, апубл. 1965) — маштабнаму твору паэт. эпасу аб часе, лёсе мастацтва і шляхах яго развіцця, аб індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У 1920-я г. паэзія Д. вызначала істотныя асаблівасці літ. працэсу, рабіла плённы ўплыў на многіх бел. паэтаў. Пра мужнасць жанчыны, яе нялёгкі лёс у Вял. Айч. вайну, маральную чысціню і самаахвярнасць пісаў у шэрагу балад і паэмах «Перад іменем Любові» (1958), «Беларуская Арыядна» (1960). Поліфанічнай песняй пра Беларусь і яе народ стала кн. «Палеская рапсодыя» (1961, Літ.

У.М.Дубоўка.

прэмія імя Я.Купалы 1962). Аўтар навук.-прыгодніцкіх аповесцей для дзяцей «Жоўтая акацыя» (1967) і «Ганна Алелька» (1969), якія займальна папулярызуюць доследніцтва, вучаць па-гаспадарску ставіцца да прыроды. Аўтабіягр. апавяданні-абразкі склалі кн. «Пялёсткі» (1973). З высокім майстэрствам рабіў апрацоўкі фальклорных сюжэтаў (зборнікі «Цудоўная знаходка», 1960; «Кветкі — сонцавы дзеткі», 1963; «Казкі», 1968; «Залатыя зярняты», 1975). На бел. мову перакладаў творы У.Шэкспіра («Санеты», 1964), Дж.Байрана (вершы, паэмы «Шыльёнскі вязень», «Бронзавы век», містэрыя «Каін»), І.В.Гётэ, У.Сыракомлі, Ю.Славацкага, Ду Фу, Абу-ль-Фараджа аль-Ісфахані, А.Пушкіна, Брусава, С.Ясеніна, А.Пракоф'ева, П.Тычыны, У.Сасюры, М.Рыльскага і інш. Аўтар артыкулаў пра бел. л-ру, фальклор, мову і інш.

Тв.: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1965; [Вершы]. Мн., 1970; Як Алік у тайзе заблудзіўся. Мн., 1974.

Літ.: Бугаёў Дз. Уладзімір Дубоўка. Мн., 1965; Яго ж. Талент і праца. Мн., 1979. С. 3—49; Арочка М. Саюз часу і майстэрства. Мн., 1981. С. 86—117; Лойка А., Пшыркоў Ю. Пясняр высокіх дум і глыбокіх пачуццяў // На высокай хвалі. Мн., 1980; Гардзіцкі А. Дыялогі. Мн., 1968. С. 47—62. *Дз.Я.Бугаёў.*

ДУ́БРА, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Абабіца, за 17 км на ПнУ ад г. Браслаў. Пл. 1,06 км^2, даўж. 2,2 км, найб. шыр. 710 м, найб. глыб. 2,9 м, даўж. берагавой лініі больш за 6 км. Пл. вадазбору 19,3 км^2. Схілы катлавіны выш. да 3 м, пад лугам. Уздоўж паўн.-ўсх. берага парослая хваёвым лесам пясчаная озавая града выш. да 9 м. Берагі нізкія, у залівах забалочаныя, тарфяністыя. 2 астравы агульнай пл. 0,7 га. Мелкаводдзе да глыб. 1 м (акрамя заліваў) пясчанае. Надводная расліннасць утварае паласу шыр. да 25 м, залівы зараслі. Злучана пратокай з

воз. Берца, на Пд сцёк па пратоцы ў воз. Абаб'е.

ДУ́БРАЎКА, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл., на р. Вуць. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 41 км на ПдУ ад Добруша, 52 км ад Гомеля, 13 км ад чыг. ст. Церахоўка. 290 ж., 158 двароў (1997). Дом культуры, б-ка. Брацкая магіла сав. воінаў.

ДУ́БРАЎКА, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 6 км на ПдЗ ад г. Мар'іна Горка, 69 км ад Мінска, 6 км ад чыг. ст. Пухавічы. 923 ж., 273 двары (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ДУ́БРАЎКА, вёска ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Ушачы—Ула. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 36 км на У ад Ушачаў, 100 км ад Віцебска, 45 км ад чыг. ст. Полацк. 441 ж., 150 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ДУ́БРАЎСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, у Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., за 25 км на ПнУ ад Мінска, на тэр. зоны адпачынку Раўбічы. Створана на р. Усяжа ў месцы ўпадзення ў яе р. Дубраўка ў 1983. Пл. 3,5 км^2, даўж. 6,5 км, найб. шыр. 1,2 км, найб. глыб. 14 м, аб'ём вады 22,4 млн. м^3. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 8 м. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель, воднага добраўпарадкавання прылеглых вёсак, адпачынку, рыбаводства.

ДУ́БРАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Тураўлянка, за 26 км на У ад г.п. Ушачы. Пл. 0,26 км^2, даўж. 580 м, найб. шыр. 580 м, найб. глыб. 6,1 м, даўж. берагавой лініі 2 км. Схілы катлавіны выш. да 12 м, параслі хмызняком.

ДУБРО́ВА, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 8 км на З ад Лельчыц, 215 км ад Гомеля, 75 км ад чыг. ст. Ельск. 960 ж., 370 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДУБРО́ВА, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 40 км на З ад Рэчыцы, 90 км ад Гомеля, 15 км ад чыг. ст. Бабічы. 192 ж., 106 двароў (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аптэка.

ДУБРО́ВЕНСКАЯ КЕРА́МІКА, ганчарныя вырабы з г. Дуброўна Віцебскай вобл. Стараж. промысел, найб. развіцця дасягнуў у 19 — 1-й пал. 20 ст. Выраблялі чорназадымлены, непаліваны, гартаваны, паліваны з размалёўкай і без яе гасп. посуд (гаршкі, збанкі, гладышы, міскі, вазоны, цёрлы і інш.), а таксама цацкі. Д.к. адметная простымі лаканічнымі формамі і дакладнымі прапорцыямі. Цацкі вылучаюцца архаічным абліччам. У 1950—70-я г. выраблялі задымлены, сінявата-чорнага колеру посуд з матавай шурпатай паверхняй, аздоблены хвалістымі палосамі, прадрапанымі па сырым чарапку, і цацкі, задымленыя ці афарбаваныя ў белы колер.

Літ.: Елатомцева И. Художественная керамика Советской Белоруссии. Мн., 1966; Сахута Я. Беларуская народная гліняная цацка. Мн., 1982. *Я.М.Сахута.*

ДУБРО́ВЕНСКАЯ ТЭКСТЫ́ЛЬНАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1900—41. Знаходзілася за 7 км ад чыг. ст. Асінаўка (цяпер у Дубровенскім р-не). Выпускала баваўняныя, шаўковыя, джутавыя тканіны, пражу. У 1908—13 працавала 488 рабочых, былі паравыя рухавікі, 160 ткацкіх станкоў, 120 круцільных верацён. У Вял. Айч. вайну эвакуіравана ў Барнаул, увайшла ў склад Барнаульскага камвольнага камбіната.

ДУБРО́ВЕНСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 16—18 ст. Размяшчаўся каля сутокаў

Да арт. **Дубровенская керамика**. Цацка «Пара». Пач. 20 ст.

Дубровенская керамика.

рэк Дубровенка і Дняпро. Меў выгляд прамавугольніка (каля 125 × 45 м). Паводле інвентара (складзены 28.5.1545), у цэйхгаўзе замка знаходзіліся 242 адзінкі агнястрэльнай зброі, шмат інш. ваен. рыштунку. У 1535 і 1562 замак спалены рус. войскам, але хутка адноўлены. У ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 і Паўн. вайны 1700—21 яго зноў займалі і спальвалі рус. войскі. У 1730-я г. Д.з. адноўлены і праіснаваў да 1772.

ДУБРО́ВЕНСКІ ПІ́ЯРСКІ КАЛЕ́ГІУМ. Дзейнічаў з вер. 1785 да лета 1797 у Дуброўне. У 1780 *піяры* былі запрошаны сюды са згоды біскупа С.*Богуша-Сестранцэвіча* замест бернардзінцаў, якімі тагачасны гаспадар мястэчка кн. Р.А.Пацёмкін быў незадаволены. Пацёмкін ахвяраваў піярам агарод і лугі ў Дуброўне, маёнтак Азоркава (80 двароў, 450 рэвізскіх душ), буйныя грашовыя сродкі і інш.; быў пабудаваны драўляны кляштар. У 1783 мястэчка перайшло ва ўласнасць кн. К.Любамірскага, які пацвердзіў усе ахвяраванні свайго папярэдніка. У 1785 пры кляштары адкрыты калегіум, у ім былі 4 класы, вучылася 60 чал. Летам 1797 з-за асабістага канфлікту з піярамі Любамірскі выгнаў іх з мястэчка. Калегіум аднавіў дзейнасць у 1799 у Віцебску і знаходзіўся там да лета 1822, на яго базе было ўтворана *Полацкае вышэйшае піярскае вучылішча*.

А.Ф.Самусік.

ДУБРО́ВЕНСКІ РАЁН, на ПдУ Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Пл. 1,3 тыс. км^2. Нас. 24 тыс. чал. (1997), гарадскога 38%. Сярэдняя шчыльн. 20 чал. на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. *Дуброўна*, р.п. *Асінторф*, 149 сельскіх населеных пунктаў. Падзяляецца на 10 сельсаветаў: Баеўскі, Валяўкоўскі, Дабрынскі, Зарубскі, Засценкаўскі, Кляноўскі, Малабахаўскі, Маласавінскі, Пірагоўскі, Рэдзькаўскі.

Паверхня раўнінная, хваліста-платопадобная. На Пд частка *Смаленскага ўзвышша*, на ПнЗ адгор'е *Аршанскага ўзвышша*, на Пн *Лучоская нізіна*. Найвышэйшая адзнака 226,4 м (на ПдЗ ад в. Ляхаўка). Пераважаюць вышыні 180—210 м. Карысныя выкапні: торф, гліны, гравій, пясок. Сярэдняя т-ра студз. -8 °С, ліп. 17,8 °С. Ападкаў 618 мм за год. Вегетац. перыяд 184 сут. З ПнУ на ПдЗ раёна перасякае р. Дняпро з прытокамі Мярэя, Расасенка, Дубровенка (Задубровенка), на Пн — Вяркіта, на ПдЗ — вяркоўі Проні і Басі. Па тэр. раёна праходзіць Балтыйска-Чарнаморскі водападзел. Найб. азёры Казённае і Афанасьеўскае. Дзярнова-падзолістыя і дзярнова-падзолістыя забалочаныя глебы займаюць 91,4% с.-г. угоддзяў. Пад лесам 19% тэр., пераважна на Пн. Лясы хваёвыя, яловыя, бярозавыя і інш., трапляюцца шыракалістыя, з іх 72% — штучныя насаджэнні. Балоты займаюць каля 5,2 тыс. га, найб. *Асінаўскае балота* і Шчэрбінскі Мох. Зоны адпачынку Лясная дача і Дняпроўка.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 78 тыс. га, з іх асушана 27 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 13 калгасаў, 7 саўгасаў, міжгасп. прадпрыемства па кормавытворчасці. С.-г. вытв-сць спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і льнаводстве, пашыраны пасевы збож-

жавых культур і бульбы. Прадпрыемствы паліўнай, лёгкай, харч. і буд. матэрыялаў прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтадарога Брэст—Масква, транзітныя магістральныя

газаправоды. Дуброўна аўтадарогамі звязана з Оршай, Горкамі, Асінторфам, Красным (Расія). У раёне 14 сярэдніх, 9 базавых, 4 пач. і 3 муз. школы, школа-інтэрнат, дзіцяча-юнацкая спарт. школа, 18 дашкольных устаноў, СПТВ, 2 бальніцы, 16 фельч.-ак. пунктаў, 28 дамоў культуры і клубаў, 28 б-к. Помнікі архітэктуры: паркі ў в. Арловічы (19 — пач. 20 ст.) і ў в. Станіслававо (19 ст.). Выдаецца газ. «Дняпроўская праўда».

Г.С.Смалякоў.

ДУБРО́ВЕНСКІ СТРОЙ, традыцыйны комплекс бел. нар. адзення ў Падзвінні. Бытаваў у 19 — пач. 20 ст. пераважна ў Віцебскай вобл., часткова на Смаленшчыне. У строі пераважалі блакітныя фарбы (паўплывала набіванка) і дробнаклятчастыя ўзоры на паясных адзежынах. Старадаўні жаночы касцюм складаўся з кашулі, спадніцы (андарак, саматканка), ільнянога фартуха і курты, больш позні — з кашулі, фартуха, спадніцы з прышыўным ліфам і поясам (сян — накшталт сукенкі без рукавоў). Святочную кашулю кроілі з прамымі плечавымі ўстаўкамі, гесткай, будзённую і сподню — тунікападобнай, з разрэзам па цэнтры грудзей; стаячы каўнер зашпіляўся шпонкай ці гузікам або сцягваўся чырв. стужкай. Узорыстае ткацтва, вышыўка спалучаліся з разнаколернай аплікацыяй, аблямоўкамі, устаўкамі чырвонай або сіняй крашаніны ці кумачу. Чырвоны арнамент (строгія геам. формы, шматпялёсткавыя зоркі, раслінныя ўзоры) дапаўняўся блакітным, чорным, зрэдку паскамі медна-чырв. бліскавак. Спадніцу кроілі ў 4—6 полак з пярэстатканага сіне-белага, чырвона-бурачковага палатна. Спадніцу з ліфам шылі з 2, часам розных па якасці і колеру тканін, дапаўнялі белым ці набіваным фартухом і поясам, на канцы якога нашывалі бісер. Суконную світу ў выглядзе безрукаўкі пацягвалі белым каленкорам, аздаблялі нашыўкамі чырв. сукна, лапікамі чорна-белай аўчыны ўздоўж зрэзаў. Галаўныя ўборы жанчын — хусткі, чапцы. У мужчынскі гарнітур уваходзілі кашуля, нагавіцы, пояс. Жаночай і мужчынскай вопраткай былі армяк, світа, бурка, кажух.

М.Ф.Раманюк.

ДУБРО́ВЕНСКІЯ СУКО́ННЫЯ МАНУФАКТУ́РЫ. Дзейнічалі ў 1780—1861 у г. Дуброўна. З мануфактуры (уладальнікі: князі Любамірскія, Евельсон, Гінзбург) і суконная ф-ка графа Пацёмкіна выраблялі тканіну. На мануфактурах у 1814—19 было 12—31 ткацкіх станкоў і 100—260 вольнанаёмных рабочых. На ф-цы Пацёмкіна працавалі 300 прыгонных.

ДУБРО́ВІН Аляксандр Іванавіч (1855—1921), расійскі паліт. дзеяч. Скончыў Медыка-хірург. акадэмію ў Пецярбургу (1879). Д-р медыцыны. З 1905 старшыня гал. савета манархічнай партыі *«Саюз рускага народа»*, выдавец і рэдактар газ. «Русское знамя». У 1910 выступіў супраць агр. рэформы П.А.*Сталыпіна*, што прывяло да расколу ў партыі і адстаўкі Д. з пасады яе кіраўніка. З 1912 арганізатар і пажыццёвы старшыня «Усерас. дубровінскага саюза рус. народа». У 1920 арыштаваны ВЧК за антысав. дзейнасць і расстраляны.

ДУБРО́ВІН Мікалай Фёдаравіч (8.12.1837, с. Карытава Пскоўскай вобл., Расія — 25.6.1904), расійскі ваен. гісторык. Акад. Пецярбургскай АН

Да арт. **Дубровенскі строй**. Жанчына ў летнім адзенні. Вёска Ланенка Дубровенскага раёна Віцебскай вобл.

(1890). Ген.-лейт. (1888). Скончыў Міхайлаўскую артыл. акадэмію (1862). З 1869 служыў пры Гал. штабе для ваен.-гіст. работ. Чл. Ваен.-вучонага к-та (з 1882) і Імператарскага рус. гіст. т-ва (з 1884), вучоны сакратар Пецярбургскай АН (з 1893), рэдактар час. «Русская старина» (з 1896). Складальнік і рэдактар зб-каў дакументаў «Айчынная вайна ў пісьмах сучаснікаў (1812—1815 гг.)» (1882), «Далучэнне Крыма да Расіі» (т. 1—4, 1885—89) і інш. Аўтар кн. «Гісторыя Крымскай вайны і абароны Севастопаля» (нап. 1874, выд. т. 1—3, 1900), «Гісторыя вайны і панавання рускіх на Каўказе» (т. 1—6, 1871—78), «Пугачоў і яго саўдзельнікі» (т. 1—3, 1884) і інш.

ДУБРО́ВІН Юрый Мікалаевіч (1.4.1937, г. Курган, Расія — 28.6.1983), бел. кінаакцёр і рэжысёр. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1959). З 1960 на кінастудыі «Беларусьфільм». У 1965 дэбютаваў як рэжысёр (кароткаметражны маст. фільм «Снежны конь»). Здымаў дакумент. («Людзям на заглядзенне», 1965, «Брэсцкая крэпасць», 1967) і тэлевізійныя [«Побач з вамі», 1967, «Вашынгтонскі карэспандэнт» (3 серыі) і «Міравы хлопец», абодва 1972, «Вялікае супрацьстаянне», 1974, «Антаніна Брагіна», 1978, «Звон адыходзячага лета», 1979] фільмы.

ДУБРО́ВІЧ Алесь (сапр. Рэдзька Аляксей Ягоравіч; 1910, в. Каралевічы

А.Дубровіч.

Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. — 7.11.1942), бел. паэт. Удзельнік вызв. руху ў Зах. Беларусі. Адзін з ініцыятараў стварэння *Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў*. У 1934 арыштаваны, 2,5 года адбыў у Віленскай турме на Лукішках. Дэлегат Нар. сходу ў Беластоку (1939). У 1940 карэспандэнт газ. «Вілейская праўда». Друкавацца пачаў у 1928 у газ. «Доля працы». Спалучэнне публіцыст. запалу з мяккім лірызмам — характэрная асаблівасць яго паэзіі. У вершах боль прыгнечанага народа («Беларусь»), гераізм змагароў і іх высокі духоўны свет («Калісь любові хмель вясняны», «Пад звон дратоў, сумуючы»), заклік да барацьбы за свабоду («Мы», «Зорны край»). Расстраляны ням.-фаш. захопнікамі.

Тв.: У кн.: Сцягі і паходні. Мн., 1965; У кн.: Крывёю сэрца. Мн., 1967. *М.М.Чамеза.*

ДУБРО́ВЫ, тое, што *дубовыя лясы*.

ДУБРО́ЎКА (Potentilla), род кветкавых раслін сям. ружавых. Больш за 300 відаў. Пашырана пераважна ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі больш за 20 дзікарослых і 3 інтрадукаваныя віды. Найб. вядомыя Д. гусіная, або гусіная лапка (P. anserina), прамастойная, або калган (P. erecta), серабрыстая (P. argentea), нарвежская (P. norvegica), паўзучая (P. reptans), радзей трапляюцца Д. белая (P. alba), прамая (P. recta), пясчаная (P. arenaria); Д. скальная (P. rupestris) занесена ў Чырв. кнігу Беларусі. Растуць на сухіх сонечных мясцінах, у лясах, на балотах, каля жылля, як пустазелле. У Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі інтрадукаваны Д. цёмна-крывава-чырвоная (P. atrosanguinea), пурпуровая (P. purpurea) і непальская (P. nepalensis).

Дуброўка белая.

Дуброўнік часночны.

Шмат-, радзей двух- і аднагадовыя травяністыя расліны, паўкусты і паўкусцікі. Сцяблы прамастойныя, прыўзнятыя або сцелюцца. Лісце пальчата- або перыста-складанае. Кветкі жоўтыя або пурпуровыя, з 5—4 пялёсткамі, адзіночныя або ў шчыткападобнамяцёлчатых суквеццях. Плод — шматарэшак. Лек., меданосныя, дубільныя, фарбавальныя, харч. і дэкар. расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДУБРО́ЎКА, радовішча жвірова-пясчанага матэрыялу і пяскоў у Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл., каля в. Дуброўка. Паклад звязаны з надмарэннымі адкладамі сожскага зледзянення. Жвірова-пясчаная парода шаравата- і бураватажоўтая, месцамі гліністая; пяскі розназярністыя. Разведаныя запасы 25,1 млн. м^3, перспектыўныя 6,7 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 2—12,6 м, ускрышы (супескі, пяскі) 0,2—7 м. Жвір і пяскі прыдатныя для дарожнага буд-ва. Радовішча распрацоўваецца.

А.П.Шчураў.

ДУБРО́ЎНА, горад, цэнтр Дубровенскага р-на Віцебскай вобл., на р. Дняпро, пры ўпадзенні ў яго рэк Дубровенка і Свінка. За 107 км ад Віцебска, 8 км ад чыг. ст. Асінаўка на лініі Орша—Смаленск; аўтадарогамі злучаны з Оршай і Горкамі. 9,7 тыс. ж. (1997).

Ў пач. 16 ст. Д. — цэнтр буйной воласці на мяжы Віцебскага і Смаленскага ваяв. У розны час належала Глябовічам, Сапегам, А.Д.Меншыкаву, Р.А.Пацёмкіну, Любамірскім. У 16—18 ст. у Д. існаваў *Дубровенскі замак*. З 1772 Д. ў Аршанскай правінцыі, з 1777 — у Аршанскім пав. Магілёўскага намесніцтва. Дзейнічалі 4 правасл. царквы, бернардзінскі кляштар з касцёлам, сінагога, паштовы дом. У 1784 пабудавана 1-я ў Рас. імперыі гадзіннікавая ф-ка. У 1785—97 тут існаваў *Дубровенскі піярскі калегіум*. З 1861 цэнтр воласці Горацкага пав. Магілёўскай губ. У 1897 — 7974 ж. З 1924 раённы цэнтр, з 3.7.1925 горад. 9,9 тыс. ж. (1939). З 16.7.1941 да 26.6.1944 акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія знішчылі ў Д. і раёне 14 110 чалавек. 4,9 тыс. ж. (1959). У 1962—65 Д. ў Аршанскім р-не.

Прадпрыемствы харч., лёгкай, буд. матэрыялаў прам-сці. Брацкія магілы супрацоўнікаў міліцыі, сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнікі: Вызвалення, Г.А.Нікандравай. Помнікі архітэктуры: кляштар бернардзінцаў (пач. 19 ст.), Пакроўская царква (1-я пал. 19 ст.). Цэнтр ганчарнага рамяства (гл. *Дубровенская керамика*).

ДУБРО́ЎНІК (Teucrium), род кветкавых раслін сям. яснотковых. Больш за 100 відаў. Пашыраны ва ўмераных і субтрапічных абласцях зямнога шара, асабліва ў Міжземнамор'і. На Беларусі пераважна ў паўд. раёнах (у далінах рэк Дняпро, Прыпяць, Сож) трапляецца Д. часночны (T. scordium). Расце ў прыбярэжных хмызняках, утварае зараснікі. Як дэкар. расліна ў Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі інтрадукаваны Д. усходні (T. orientale).

Шмат-, радзей аднагадовыя травяністыя расліны і паўкусты. Лісце каротка чараночкавае, суцэльнае або перыста-расчлянёнае. Кветкі дробныя, сінія, пурпуровыя, радзей белыя і жоўтыя, у несапраўдных кальчаках, сабраных у гронка-, коласападобныя ці галоўчатыя суквецці. Плод — чатырохарэшак. Меданосныя, эфіраалейныя, таніданосныя, харч. (вострапрыпраўныя) і дэкар. расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДУБРО́ЎНІК (Dubrovnik), горад у Харватыі. Каля 50 тыс. ж. (1994). Порт на беразе Адрыятычнага м. Чыпункай і аўтадарогамі звязаны з Босняй і Герцагавінай. Харч. прам-сць. Стараж. культ. цэнтр (Дуброўніцкі архіў, з 1628 сталы тэатр); з 1956 штогадовыя летнія тэатр. фестывалі. Прыморскі кліматычны курорт і цэнтр турызму. Кліматычныя ўмовы спрыяльныя для лячэння хвароб органаў дыхання (у т.л. бранхіяльнай астмы), сардэчна-сасудзістых, алергічных хвароб скуры і інш. Старая частка Д. — цэласны гарадскі комплекс 14—18 ст. з палацамі і манастырамі эпохі Адраджэння, у т.л. палацы Княжацкі двор (2-я пал. 15 ст.) і Дывона — б. мытня і манетны двор (1516—21), манастыры — францысканскі (1-я пал. 14 ст.) і дамініканскі (14—15 ст.), цэрквы ў стылі барока (17 і 18 ст.) і інш. Пашкоджаны землетрасеннем 1979. Моцна разбураны ў час сербска-харвацкай вайны 1991—92. Стары горад Д. уключаны ў спіс *Сусветнай спадчыны*.

Засн. ў 7 ст. славянамі. З 9 ст. да 1205 пад уладай Візантыі. У 1205—1808 самаст. камуна-рэспубліка (Дуброўніцкая рэспубліка, уключала горад, ч. ўзбярэжжа на ПнЗ ад яго, п-аў Пелешац, а-вы Шыпан, Ластава, Млет і інш.); васал (плаціла даніну) Венецыі (1205—1358), Венгрыі (да 1526), Турцыі (1526—1806). Культ. росквіт («паўд.-слав. Афіны») прыпадае на 14—17 ст., эканам. (мараходства, марскі і сухап. гандаль, мясц. рамёствы) — на 16—17 ст. Пасля землетрасення 1667 паступова заняпаў. У 1806—14 акупіраваны франц. войскамі, у 1815—1918 пад уладай Аўстрыі. З 1919 у Каралеўстве сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія). У 2-ю сусв. вайну акупіраваны войскамі фаш. Італіі (крас. 1941 — канец 1944). Пасля распаду саюзнай Югаславіі застаўся ў складзе Харватыі.

Літ.: Rapacka J. Rreczpospolita Dubrownicka. Warszawa, 1977; Фрейденберг М.М. Дубровник и Османская империя. 2 изд. М., 1989.

ДУБРО́ЎНІЦКАЯ РЭСПУ́БЛІКА. Існавала на частцы тэр. Харватыі (у гіст. вобласці *Далмацыя*) у 12 — пач. 19 ст. Гл. ў арт. *Дуброўнік*.

ДУБРО́ЎНЯ, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Нарва каля аўтадарогі Ліда — в. Ліпнішкі. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 5 км на У ад Ліды, 115 км ад Гродна, 2 км ад чыг. ст. Гутна. 397 ж., 134 двары (1997). Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДУБРО́ЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА НА́ФТЫ, у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., за 25 км на З ад г. Рэчыца. Адкрыта ў 1979, распрацоўваецца з 1980. Паклады нафты пл. каля 6 км^2 прымеркаваны да міжсалявых і падсалявых адкладаў верхняга дэвону на Пн Прыпяцкага прагіну ў межах Рэчыцка-Вішанскай тэктанічнай зоны. Нафтаносныя гарызонты залягаюць на глыб. 2900—3900 м. Пароды калектары — трэшчынавата-кавернозна-парыстыя даламіты і вапнякі. Нафта высокапарафінавая, маласмаліс-

тая, маласярністая, лёгкая, малавязкая з удзельнай вагой 0,87 г/см^3. *А.П.Шчураў.*

ДУБРО́ЎСКІ Віктар Паўлавіч (15.12.1927, г. Варонеж, Расія — 17.10.1994), рускі і бел. дырыжор. Засл. арт. Беларусі (1959), нар. арт. Расіі (1969). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю па класах скрыпкі (1949) і сімф. дырыжыравання (1953). З 1952 працаваў у розных аркестрах Расіі, у т.л. ў Дзярж. сімф. аркестры СССР, Дзярж. акад. рус. нар. аркестры імя Осіпава, сімф. аркестры Смаленскай філармоніі (з 1994 імя Д.). У 1956—62 і 1991—94 гал. дырыжор Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі. У рэпертуары буйныя творы муз. класікі, сучасных аўтараў. Першы інтэрпрэтатар многіх твораў бел. кампазітараў, у т.л. 5-й сімфоніі М.Аладава, сімф. паэмы «Нарач» У.Алоўнікава, вак.-сімф. паэмы «Вечна жывыя» і «Святочнай уверцюры» Г.Вагнера, фантазіі на тэмы бел. нар. песень В.Залатарова, 2-га канцэрта для скрыпкі з арк. П.Падкавырава, сімф. паэмы «Сказ пра Палессе» У.Будніка, 8-й сімфоніі Дз.Смольскага і інш.

Дуброўнік. Від старой часткі горада.

ДУБРО́ЎСКІ (сапр. Чарняўскі) Ігнат Цімафеевіч (н. 4.9.1906, в. Дуброва Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. пісьменнік і вучоны. Канд. с.-г. н. (1937). Засл. работнік культ. Беларусі (1981). Скончыў БСГА (1931). У 1937—41 навук. супрацоўнік, у 1945—76 заг. сектара аграрных праблем Ін-та эканомікі Нац. АН Беларусі. Першыя вершы апубл. у 1927. Аўтар зб-каў апавяданняў «Радня» (1954), «Паўз самыя вокны» (1961), аповесцей «Зямля маладзее» (1952), «Зямныя вузлы» (1965), кніг нарысаў. Пачынальнік аналітычнага нарыса ў бел. л-ры. Пісьменніка хвалююць актуальныя тэмы сучаснасці: вытворчыя, сацыялагічныя, культурныя праблемы вёскі і горада, меліярацыя, ахова прыроды і інш. Як даследчык вывучае эканоміку сельскай гаспадаркі Беларусі.

Тв.: Светлы шлях. Мн., 1959; Да долі чалавечай. Мн., 1970; Гамоніць Палессе. Мн., 1977; На новыя кругі. Мн., 1980; Час сеяць і час жаць. Мн., 1982; Красна хата не толькі прагамі. Мн., 1988; Нялёгкі хлеб. Мн., 1990.

Літ.: Лысенка А.Ф. Сучасны беларускі нарыс. Мн., 1978; Беларуская літаратура: Дзень сённяшні. Мн., 1980. С. 289—297.

ДУБРО́ЎСКІ Мікалай Аляксандравіч (н. 25.12.1938, в. Казылі Елабужскага р-на, Татарстан), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1996). Скончыў Томскі політэхн. ін-т (1964) і працаваў у ім. З 1978 у Наваполацкім політэхн. ін-це. Даследуе праблемы кіравання прадукцыйнасцю працы, фарміравання сістэмы кіравання прадпрыемствам ва ўмовах рыначных адносін. Аўтар прац «Выбар спосабаў механічнага рыхлення мёрзлых грунтоў» (1977), «Кіраванне прадукцыйнасцю працы пры распрацоўцы мёрзлых грунтоў» (1993).

ДУБРО́ЎСКІ Міхась (Міхаіл Георгіевіч; 3.10.1897, в. Казелле Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — 11.9.1983), бел. пісьменнік. Скончыў Вышэйшы літ.-маст. ін-т імя В.Брусава (1925). У 1925—26 навук. супрацоўнік Інбелкульта. У 1926—45 жыў і працаваў у Маскве і ў Башкірыі. З 1945 у Брэсцкім настаўніцкім ін-це, з 1949 у Літ. ін-це імя М.Горкага (Масква), у 1950—57 у Гродзенскім пед. ін-це. Друкаваўся з 1918. Аўтар вершаў, баек, артыкулаў, лібрэта оперы «Уласнаю рукою» (1928—29, з П.Шастаковым). Асобным выданнем у перакладзе Д. выйшла «Балада Рэдынгскай турмы» О.Уайльда (1926). На бел. мову пераклаў асобныя санеты І.Бехера, А.Міцкевіча, Ф.Петраркі, У.Шэкспіра, вершы П.Б.Шэлі, А.Ч.Суінберна і інш.

ДУБРО́ЎСКІ Фёдар Фаміч (17.4.1901, в. Замошша Ушацкага р-на Віцебскай вобл. — 3.3.1970), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Вял. Айч. вайну, ген.-маёр (1943), Герой Сав. Саюза (1943). У Чырв. Арміі з 1918. Скончыў Вышэйшую цэнтр. калгасную школу (1932). Удзельнік грамадз. вайны на Зах. фронце. З 1929 на адказных пасадах у с.-г. органах Віцебскай вобл. Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну арганізатар падполля ў Віцебскай вобл., з 1942 камандзір партыз. атрада, у жн. 1942 — чэрв. 1944 камандзір Чашніцкай партыз. брыгады «Дубава». У 1944—53 сакратар Чашніцкага райкома КП(б)Б, дырэктар саўгасаў.

І.Ц.Дуброўскі.

Ф.Ф.Дуброўскі.

ДУБРО́ЎШЧЫК Вольга Ільінічна (н. 27.3.1944, в. Вялікая Сліва Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1993), праф. (1995). Скончыла Гродзенскі мед. ін-т (1972) і працуе ў ім. Навук. працы па пытаннях лячэння тромбаабліторыруючых хвароб, рэканструктыўна-аднаўленчай страўнікавай хірургіі і метадам зніжэння аперацыйнага стрэсу.

Тв.: Методы снижения величины и продолжительности операционной стресс-реакции у больных с тяжелой хирургической патологией (новые направления предоперационной подготовки). Гродно, 1990 (разам з І.Я.Макшанавым, Я.А.Тамашчыкам); Calcium pantothenate and antioxidant vitamins in prevention of surgical stress (у сааўт.) // Natural antioxidants and food quality in atherosclerosis and cancer prevention. Helsinki, 1996.

ДУ́БЧАК (Dubček) Аляксандр (27.11.1921, Угровец, Славакія — 7.11.1992), чэшскі і славацкі паліт. дзеяч. У 1929—38 разам з бацькамі жыў у СССР. З 1939 чл. кампартыі Чэхаславакіі (КПЧ). Удзельнік *славацкага нацыянальнага паўстання 1944*. Чл. ЦК (1958—70) і Палітбюро (1963—69) КПЧ. У 1963—68 1-ы сакратар ЦК кампартыі Славакіі. У студз. 1968 — крас. 1969 1-ы сакратар ЦК КПЧ, кіраўнік рэфарматарскага крыла партыі (ідэя «сацыялізму з чалавечым тварам»), ініцыятар *«пражскай вясны»*. Пасля ўводу войск Варшаўскага дагавору ў Чэхаславакію (жн. 1968) пад націскам сав. парт. і дзярж. кіраўніцтва пагадзіўся спыніць ліберальныя пераўтварэнні («маскоўскае пагадненне»). У 1970 выключаны з партыі. З 1989 чл. *«Грамадзянскага форуму»*. Палітычна рэабілітаваны ў выніку *«аксамітнай рэвалюцыі 1989*. Дэп. Федэральнага сходу (парламента) у 1951—54, 1960—69 і з 1989, яго старшыня ў 1989—92. Удзельнік руху «Грамадства супраць насілля» (1989—91). У 1992 старшыня С.-д. партыі Славакіі. Загінуў у аўтакатастрофе. Аўтар успамінаў «Жыццё за свабоду» (апубл. ў 1993).

ДУБЫ́-ВО́ЛАТЫ, гл. ў арт. *Дрэвы-помнікі*.

ДУБЯ́ГА Дзмітрый Іванавіч (3.10.1849, с. Соіна Смаленскай вобл., Расія —

22.10.1918), расійскі астраном. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1872). Працаваў у Пулкаўскай астр. абсерваторыі. У 1884—1918 дырэктар Казанскай абсерваторыі, з 1901 дырэктар заснаванай ім паблізу г. Казань абсерваторыі імя В.П.Энгельгарта. У 1899—1905 рэктар

Дз.І.**Дубяга**.

Казанскага ун-та. Навук. працы па тэарэт. астраноміі, астраметрыі і гравіметрыі. Даследаваў арбіту спадарожніка Нептуна, стварыў тэорыю руху малой планеты Дыяны. Па назіраннях казанскіх астраномаў склаў каталог 4281 зоркі.

Літ.: Библиография русской астрономической литературы 1800—1900 гг. М., 1968 (Тр. Гос. астрономического ин-та. Т. 37); Баранов В.А. Памяти Д.И.Дубяго (3 октября 1849 — 22 октября 1918). Казань, 1919.

ДУБЯНЕ́ЦКАЯ ПРАЧЫ́СЦЕНСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства ўсходнепалескай школы (гл. ў арт. *Палескія школы дойлідства*). Пабудавана ў 1718 у в. Дубянец (Столінскі р-н Брэсцкай вобл.). Мае рысы стылю барока. Трохзрубны аб'ём глыбінна-прасторавай кампазіцыі складаецца з прамавугольнага бабінца (у 19 ст. да яго прыбудавана званіца), квадратных у плане нефа і алтара з рызніцай. Неф завершаны масіўным светлавым васьмерыковым барабанам, накрытым купалам. Сцены гарызантальна ашаляваныя. У інтэр'еры ветразі барабана аздоблены размалёўкай.

Дубянецкая Прачысценская царква.

ДУБЯНЕ́ЦКІ Міхаіл Фёдаравіч (4.3.1927, в. Востраў Пінскага р-на Брэсцкай вобл. — 3.9.1990), бел. перакладчык і публіцыст. Брат С.Ф.*Дубянецкага*. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КПБ (1956), Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1960). Настаўнічаў, працаваў у прэсе, на парт. рабоце, у 1968—75 — інструктар сектара друку ЦК КПБ, у 1975—79 адказны сакратар, нам. гал. рэдактара БелСЭ, у 1979—86 — дырэктар выд-ва «Мастацкая літаратура». Друкаваўся як публіцыст з 1959. З 1964 выступаў як перакладчык з рус., укр., польскай моў. На бел. мову пераклаў аповесці «Жыві і помні» В.Распуціна (1982), «Клімко» Г.Цюцюнніка (1982), «Гэта дзіўнае жыццё: Аповесці і апавяданні» Д.Граніна (1983), «Блакадную кнігу» А.Адамовіча і Граніна (1983), «Верная рака: Аповесць. Апавяданні. Абразкі» С.Жаромскага (1985), зб. укр. апавяданняў «Сцежка без канца» (1980). Пераклады Д. вылучаюцца глыбокім адчуваннем слова кожнай мовы, адэкватнасцю яму эквівалентаў у бел. моўнай стыхіі.

І.У.Саламевіч.

ДУБЯНЕ́ЦКІ Станіслаў Фёдаравіч (н. 1.9.1940, в. Востраў Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. філосаф і палітолаг. Канд. філас. н. (1989). Брат М.Ф.*Дубянецкага*. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1966) і Мінскую вышэйшую парт. школу (1973). Настаўнічаў, быў на культ.-асв. і парт. рабоце (у 1979—89 інструктар ЦК КПБ). З 1989 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. З 1993 у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя». Даследуе праблемы нац. і маральнай самасвядомасці, развіцця паліт. працэсу, гісторыі філас. і грамадскай думкі Беларусі. Адзін з аўтараў даведнікаў «Мысліцелі і асветнікі Беларусі» (1995), «Чалавек і грамадства» (1998), інш. энцыклапедычных выданняў.

Тв.: Центры творческой мысли. Мн., 1982; Формы и специфика проявления нравственных отклонений в условиях перестройки. Мн., 1990; Цяжкі шлях да Адраджэння. Брэст, 1997 (разам з Э.С.Дубянецкім).

ДУБЯНЕ́ЦКІ Уладзімір Іосіфавіч [Дубянецкіс (Dubeneckis) Уладас; 6.9.1888, г. Барнаул, Расія — 10.8.1932], літоўскі архітэктар, тэатр. мастак. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1906—14) у Л.*Бенуа*, выкладаў там у 1917—18 (праф. 1917). З 1919 (з перапынкамі) жыў у Каўнасе. З 1927 выкладаў у Каўнаскай маст. школе. У пабудовах выкарыстоўваў элементы барока, класіцызму, літоўскага нар. дойлідства. З арх. М.Сангайлам зрабіў рэканструкцыю Дзярж. т-ра (1923—25) і арх. праект завода «Рагуціс» (1924) у Каўнасе. Пабудаваў касцёл у в. Бяцігале (Расейняйскі р-н), адзін з аўтараў праектаў Каўнаскага гіст. музея і Маст. музея імя М.К.Чурлёніса (пабудаваны ў 1931—36). Сярод тэатр. работ (створаны пад уплывам творчасці *«Свету мастацтва»*) дэкарацыі да оперы «Трубадур» Дж.Вердзі (1929), балета «Сільвія» Л.Дэліба (1928) і інш. (усе ў Дзярж. т-ры ў Каўнасе).

ДУГА́, ў геаметрыі, частка крывой паміж двума яе пунктамі. Д. плоскай крывой вызначаюць заданнем каардынат усіх яе пунктаў пры дапамозе неперарыўных функцый $x = f(t)$, $y = \varphi(t)$ некаторага параметра t: $\alpha \le t \le \beta$; пры

Да арт. **Дуга**.

гэтым лічаць, што розным значэнням t адпавядаюць розныя пункты Д. Напр., параметрычныя ўраўненні $x = R\cos t$, $y = R\sin t$, дзе $0 \le t \le \pi/2$, вызначаюць Д. AB ($^1/_4$ акружнасці радыуса R з цэнтрам у пачатку каардынат). Д. прасторавай лініі вызначаецца параметрычнымі ўраўненнямі $x = f(t)$, $y = \varphi(t)$, $z = \psi(t)$, $\alpha \le t \le \beta$.

ДУГАВА́Я ЗВА́РКА, электрадугавая зварка, зварка плаўленнем, пры якой канцы дэталей, што злучаюцца, расплаўляюцца цеплынёй электрычнай дугі, якая ўзнікае паміж імі і электродам. Д.з. бывае ручная, аўтаматычная і паўаўтаматычная. Ручную Д.з. выконваюць электрадам, які рухаюць уручную. Пры аўтаматычнай Д.з. электрод рухаецца аўтаматычна, а пры паўаўтаматычнай — уручную. Д.з. можа быць адкрытай (дуга гарыць на паветры) і пад флюсам (дуга гарыць пад слоем флюсу). Д.з. пад флюсам — самая прадукцыйная. Яе выконваюць на спецыяльных аўтаматах і паўаўтаматах. Д.з. ў абароне газаў (вугляродзістага, інертных) выкарыстоўваюць пераважна для зварвання спецыяльных сталей, каляровых металаў і іх сплаваў.



Дугавая зварка: *а* — пакрытым электродам (1 — метал шва, 2 — расплаўлены метал, 3 — шлакавая корка, 4 — кропля металу электрода, 5 — расплаўленае пакрыццё, 6 — металічны стрыжань электрода, 7 — пакрыццё); *б* — тыпы злучэнняў (1—3 — стыкавыя, 4 — таўровае, 5 — унакладку, 6 — з адбартоўкай краёў).

ющь, награваюць *электрычнай дугой*. Дугавы разрад запальваецца паміж вырабам і электродам або толькі паміж электродамі. Цяпло дугі плавіць метал вырабу і электрода (пры няплаўкім электродзе — прысадачнага прутка). Ванна вадкага металу, што ўзнікае ў месцы зваркі, пры астыванні моцна злучае вырабы.



Схемы **дугавой зваркі**: *а* — плаўкім электродам; *б* — няплаўкім электродам; *в* — дугой ускоснага дзеяння; *г* — пад флюсам; 1 — электрод; 2 — дуга; 3 — загатоўкі, якія зварваюцца; 4 — прысадачны пруток; 5 — грануляваны флюс; 6 — ахоўны газавы пузыр; 7 — шлакавая корка на зварным шве.

Адрозніваюць Д.з.: ручную і аўтаматычную; плаўкім (стальным, алюмініевым, медным і з іх сплаваў) і няплаўкім (вальфрамавым, вугальным, графітавым) электродамі; *газазлектрычную зварку*; зварку пад *флюсам* (які ахоўвае метал ад акіслення і азатавання; робіцца спец. трактарам для Д.з.), пакрытым электродам (з ахоўнай абмазкай), сціснутай дугой (гл. *Плазменная зварка*). Пры Д.з. выкарыстоўваюць пастаянны ток (ад зварачнага пераўтваральніка) або пераменны (ад зварачнага трансфарматара). Д.з. выкарыстоўваецца пры выт-сці *зварных канструкцый*, а таксама для наплаўлення, часам рэзання металаў, злучэння шкла, фарфору, пластмас і інш. Адкрыта ў 1881 М.М.*Бенардосам*. У 1888 М.Г.*Славянаў* распрацаваў спосаб Д.з. з металічным плаўкім электродам, пабудаваў першы зварачны генератар пастаяннага току.

Літ.: Гл. пры арт. *Зварка*. *М.М.Куніцэвіч*.

ДУГАВА́Я ЛЯ́МПА, *газаразрадная крыніца святла*, якое ўзнікае пры гарэнні *электрычнай дугі* паміж вугальнымі электродамі. Найб. пашыраны Д.л. высокай інтэнсіўнасці, дадатны электрод якіх мае кнот (пераважна з солей рэдказямельных элементаў). Яркасць лямпы да 2000 Мкд/м^2. Выкарыстоўваецца ў пражэктарах, кінапраекцыйных апаратах і інш. Вынайдзена П.М.Яблачкавым у 1876 («свечка Яблачкава»).

ДУГАВА́Я ПЕЧ, прамысловая *электрычная печ*, у якой плавяць металы і інш. матэрыялы цяплом *электрычнай дугі*. Бываюць прамога дзеяння (дуга гарыць паміж электродамі і металам, што награваецца), ускоснага (непрамога) дзеяння (дуга гарыць паміж электродамі на поўнай адлегласці ад матэрыялу) і з закрытай дугой (яна гарыць пад слоем шыхты, куды ўстаўлены электроды).

Найб. пашыраны Д.п. прамога дзеяння для выплаўкі сталі (ёмістасць да 400 т) і печы з закрытай дугой для выплаўкі каляровых сплаваў, ферасплаваў, электракарунду і інш. Ёсць таксама вакуумныя Д.п. з расходавальным электродам (яго робяць з металу, які пераплаўляецца) і з нерасходвальным (з вальфраму або графіту). Такія печы выкарыстоўваюцца для *вакуумна-дугавога пераплаву* металаў і сплаваў. Нагрэў і плаўленне металаў плазменнай дугой ажыццяўляецца ў *плазменна-дугавых печах*.



Электрасталеплавільная **дугавая печ** прамога дзеяння: 1 — кажух; 2 — метал; 3 — зліўны носік; 4 — купалападобнае скляпенне (перад загрузкай шыхты паднімаецца і адводзіцца ўбок); 5 — электроды.



Схема вакуумнай **дугавой печы** з расходавальным электродам: 1 — вакуумная камера; 2 — электрод; 3 — крышталізатар; 4 — злітак, які наплаўляецца.

ДУГА́ШАЎ Газіз Ніязавіч (н. 20.12.1917, г. Алматы, Казахстан), дырыжор. Нар. арт. Казахстана (1957). Скончыў экстэрнам Алма-Ацінскую кансерваторыю (1957). У 1944—48 дырыжор, у 1956—59 гал. дырыжор, у 1969—76 дырэктар і маст. кіраўнік Каз. тэатра оперы і балета. У 1966—68 гал. дырыжор Дзярж. т-ра оперы і балета БССР, дзе кіраваў пастаноўкамі опер «Брэсцкая крэпасць» К.Малчанава і «Алеся» Я.Цікоцкага (1967), «Рыгалета» Дж.Вердзі (1968), балетаў «Альпійская балада» Я.Глебава (1967), «Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева (1968). Пад яго кіраўніцтвам зроблены запіс першай бел. тэлеоперы «Ранак» Г.Вагнера (1967). Выкладаў у Маскоўскай і Алма-Аціпскай кансерваторыях, у 1968 вёў клас опернай падрыхтоўкі ў Бел. кансерваторыі. Дзярж. прэмія Казахстана імя К. Байсеітавай 1972.

ДУ́ГЛАС (Douglass) Фрэдэрык [сапр. Б е й л і (Bailey) Фрэдэрык Агастэс Вашынгтон; люты 1817, Такаха, каля г. Істан, штат Мэрыленд, ЗША — 20.2.1895], грамадскі дзеяч, публіцыст, адзін з лідэраў *абаліцыянізму* ў ЗША. Мулат, да ўцёкаў у паўн. штаты ЗША (1838) быў рабом. З 1847 выдаваў антырабаўладальніцкую газ. «The North Star» («Паўночная зорка»). Пад уплывам Дж.*Браўна* выступіў за ўзбр. барацьбу супраць негрыцянскага рабства. Адзін са стваральнікаў першых негрыцянскіх палкоў у грамадз. вайну ў ЗША 1861—65 і кіраўнікоў руху неграў за раўнапраўе ў час Рэканструкцыі Поўдня 1865—77. Выступаў за дэмакратызацыю грамадска-паліт. жыцця краіны, за правы жанчын. Аўтар антырабаўладальніцкага аўтабіягр. твора «Аповесць пра жыццё Фрэдэрыка Дугласа, амерыканскага раба» (1845, перапрацавана ў 1855 і 1881 пад інш. назвамі).

ДУГЛА́СІЯ, дугласавая піхта, дугласія Мензіса (Pseudotsuga menziesii), від голанасенных дрэвавых раслін роду лжэтсуга, або псеўдатсуга, сям. хваёвых. Названа па імю шатл. батаніка Д. Дугласа, які апісаў і інтраду-

Дугласія Мензіса.

каваў Д. ў Еўропе. Пашырана на ціхаакіянскім узбярэжжы ЗША і Канады. На Беларусі інтрадукавана і культывуецца з пач. 20 ст. (1904; Парэцкі парк Пінскага р-на).

Шматгадовазялёнае дрэва з прамым ствалом, выш. да 25 (на радзіме да 100) м і канічнай кронай. Кара тоўстая, буравата-шэрая. Ігліца пляскатая, зялёная або шыза-зялёная. Жаночыя шышкі падоўжаныя, звіслыя, з крыючай луской. Насенне з крыльцамі. Дэкар. расліна, прыдатная для групавых і алейных пасадак, мае шэраг садовых разнавіднасцей і формаў. Расце павольна. Жыве да 500 гадоў. Выкарыстоўваецца ў дрэваапрацоўцы.

Г.У.Вынаеў.

ДУ́ГЛАС-Х'ЮМ (Douglas-Home) Аляксандр (Алек) Фрэдэрык (н. 2.7.1903, Лондан), брытанскі паліт. і дзярж. дзеяч. У 1931—45 і 1950—51 дэпутат палаты абшчын ад Кансерватыўнай партыі, адначасова (1937—39) парламенцкі сакратар прэм'ер-міністра Н.Чэмберлена, удзельнік Мюнхенскай канферэнцыі 1938. Чл. (1951—63) і лідэр (1957—60) палаты лордаў. Міністр па сувязях з краінамі брыт. Садружнасці (1956—60). Міністр замежных спраў Вялікабрытаніі ў 1960—63 (удзельнічаў у ажыццяўленні *Дагавора аб забароне і абмежаванні выпрабаванняў атамнай зброі 1963*) і 1970—74. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі ў 1963—64. Лідэр Кансерватыўнай партыі ў 1963—65.

ДУДА́, народны духавы язычковы муз. інструмент. Са старажытнасці вядома пад рознымі назвамі ў многіх народаў свету; у Беларусі, Латвіі, Літве і на Украіне, радзей у Расіі пад назвай «Д.». Уяўляе сабой скураны мех з маленькай трубачкай-«соскай» для напаўнення яго паветрам і некалькімі іграўымі трубкамі («перабор» з 7 адтулінамі для выканання мелодыі і 1—2 бурдонныя трубкі-«гукі»), якія маюць пішчык з адзінарным язычком з трысцінкі ці гусінага (індычага) пяра. У час ігры *дудар* націскае левым локцем на мех, паветра паступае ў трубкі і прымушае вібраваць язычкі. Гучанне моцнае і рэзкае. На Беларусі Д. была пашырана з 16 ст. на тэр. Віцебскай, частцы Віленскай і некат. паўн.-зах. і ўсх. паветаў Мінскай губерняў. Меладычная трубка найб. пашыранай двухгукавой Д. мае дыятанічны гукарад мажорнага нахілення; адзін гук строіўся ў актаву да меладычнай трубкі, другі — у квінту да першага. Д.-«весялуха» была вельмі папулярным муз. інструментам, выкарыстоўвалася для суправаджэння танцаў, песень і прыпевак на сямейных і каляндарных святах, ігрышчах, кірмашах, у ансамблі са скрыпкай ці са скрыпкай, цымбаламі і бубнам. Апошняе публічнае выкананне на Д. адбылося ў 1951 г. ў Полацку.

Літ.: Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые. Мн., 1979.

І.Дз.Назіна.

ДУДА́ Іван Уладзіміравіч (н. 7.2.1936, в. Дзямідаў Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл.), бел. акушэр-гінеколаг. Д-р мед. н. (1984), праф. (1986). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1961). З 1964 у Мінскім мед. ін-це, з 1990 заг. кафедры Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў. Навук. працы па фізіялогіі і паталогіі скарачальнай функцыі маткі, перынатальнай ахове плода і нованароджанага, анкагінекалогіі.

Тв.: Нарушения сократительной деятельности матки. Мн., 1989; Акушерство и гинекология в графических схемах. Мн., 1991 (разам з Л.В.Вавілавай); Клиническое акушерство. Мн., 1997 (разам з В.І.Дудой).

ДУДАКО́ВІЧЫ, вёска ў Круглянскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Гнілка. Цэнтр Ляснянскага с/с і калгаса. За 12 км на ПнУ ад Круглага, 77 км ад Магілёва, 15 км ад чыг. ст. Талачын. 291 ж., 112 двароў (1997).

Вядомы з пач. 16 ст. як вёска кн. І.Горскага па мянушцы Дуда (адсюль назва). З 16 ст.

Дуда.

належала Храптовічам, Гарнастаям, Камарам, кляштару дамініканцаў (да 1832) і інш. З 17 ст. мястэчка. З 1772 у Рас. імперыі, у Магілёўскай губ., з 1861 у Магілёўскім пав. У 1909 сяло, 446 ж., 50 двароў. З 1924 вёска ў Круглянскім, у 1931—35 у Талачынскім, у 1959—66 у Бялыніцкім р-нах. З 1964 цэнтр сельсавета. У 1971 — 329 ж., 101 двор.

Комплекс «школа-сад», клуб, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Пакроўская царква (19 ст.).

ДУДА́Р, народны музыкант, які іграў на *дудзе*. Д. вядомы на Беларусі з 16 ст. на тэр. Віцебскай, частцы Віленскай і некат. паўн.-зах. паветаў Мінскай губерняў. Былі прыкметнай з'явай у бел. нар. муз. культуры, адыгрывалі важную ролю ў побыце бел. вёскі, удзельнічалі ў каляндарных і сямейных святах. Асабліва жаданым Д. быў на вяселлі: суправаджаў маладых да вянца, іграў танцы, падыгрываў песні і прыпеўкі. Д. іграў у корчмах, на ігрышчах, кірмашах, хадзіў з *валачобнікамі* і каляднікамі, акампаніраваў у час паказаў *батлейкі*. Паводле звестак бел. этнографаў М.Нікіфароўскага, П.Шэйна, Е.Раманава Д. амаль зніклі ў канцы 19 ст., саступіўшы месца гарманісту. Пазней Д. часам называлі прафесіянала, які іграў на *дудцы* або *жалейцы*. Д. — І.Гвоздзь з Ушацкага р-на — выступаў у Полацку ў 1951.

Літ.: Никифоровский Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. [Ч.] 2. Дудар и Музыка // Этнографическое обозрение. 1892. Кн. 13—14, № 2—3; Романов Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 8. Вильна, 1912.

М.Я.Грынблат.

ДУДА́Р Алесь (сапр. Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч; 24.12.1904, в. Навасёлкі Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. — 29.10.1937), бел. паэт, крытык, перакладчык. Вучыўся ў БДУ (1927—28). Адзін з заснавальнікаў літ. аб'яднання *«Маладняк»*. У 1928 за ненадрукаваны верш «Пасеклі край наш папалам...» высланы на 3 гады ў Смаленск. Вярнуўшыся, уключыўся ў літ. жыццё. У 1936 рэпрэсіраваны. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся з 1921. Аўтар зб-каў «Беларусь бунтарская», «Сонечнымі сцежкамі» (абодва 1925), «Вежа» (1928), паэм «Шанхайскі шоўк» (1925), «Вайна за мір» (1932), «Слуцак» (1934), у якіх славіў героіку рэв. барацьбы, сац. пераўтварэнні ў горадзе і вёсцы. У зб. «І залацісцей, і сталёвей» (1926) уплыў ясенінскіх літ. традыцый, эратычныя матывы. Пісаў і прозу (прыгодніцкі раман «Ваўчаняты», 1925, з А.Александровічам і А.Вольным; зб. апавяд. «Марсельеза», 1927). Пад псеўд. Тодар Глыбоцкі друкаваўся як крытык, пераважна па пытаннях драматургіі і тэатр. мастацтва, выдаў зб. арт. «Пра нашы літаратурныя справы» (1928). Часам выказваў вульгарызатарскія ацэнкі, непрымальна ставіўся да інш. аб'яднанняў (напр., «Узвышша»), некат. пісьменнікаў. На бел. мову пераклаў паасобныя творы А.Пушкіна, В.Брусава, «Дванаццаць» А.Блока, урыўкі з «Фауста» І.В.Гётэ, «Германіі» Г.Гейнэ, творы С.Ясеніна, Б.Пастарнака, М.Ціханава, М.Рыльскага, У.Сасюры. Асобнымі выданнямі ў яго пер. выйшлі «Выбраныя вершы» С.Стандэ, аповесць Ф.Гладкова «Новая зямля», раман У.Кузьміча «Крыллі авіяспіралі», п'есы «Вільгельм Тэль» Ф.Шылера, «Жаніцьба Фігаро» П.Бамаршэ і інш.

Тв.: Выбр. творы. Мн., 1959; Вежа. Мн., 1984.

Літ.: Бечык В. Словы ўзнёслыя і шчырыя // Бечык В. Свет жывы і блізкі. Мн., 1974; Звонак А. Неспакойныя сэрцы. Мн., 1973; Міхнюк У.М. Арыштаваць у высылцы: Дакумент. нарыс пра Алеся Дудара. Мн., 1996.

І.У.Саламевіч.

ДУДА́РАВА Вераніка Барысаўна (н. 5.12.1916, Баку), расійскі дырыжор. Нар. арт. Расіі (1960). Нар. арт. СССР (1977). Скончыла Маскоўскую кансерваторыю (1947). З 1947 дырыжор, у 1960—89 гал. дырыжор і маст. кіраўнік Маскоўскага дзярж. сімф. аркестра. Выступала з многімі інш. калектывамі, у т.л. Дзярж. акад. сімф. аркестрам СССР, аркестрамі Маскоўскай і Ленін-

градскай філармоніі, лепшымі харамі Расіі. Яе творчасці ўласцівы яркі тэмперамент, своеасаблівы творчы почырк у інтэрпрэтацыі твораў. У рэпертуары пераважна сімф. музыка рус. класікаў (С.Рахманінава, А.Скрабіна, П.Чайкоўскага) і сучасных рас. кампазітараў. Дзярж. прэмія Расіі 1980.

ДУ́ДАРАЎ АляксейАнуфрыевіч (н. 6.6.1950, в. Кляны Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.), бел. пісьменнік, драматург. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т

А.Дудар.

А.А.Дудараў.

(1976). Працаваў акцёрам, заг. літ. часткі Бел. рэсп. тэатра юнага гледача (1976—79). З 1991 гал. рэдактар час. «Мастацтва». Друкуецца з 1973. Выдаў зб. апавяданняў «Святая птушка» (1979, Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1982). Па сцэнарыях Д. пастаўлены кароткаметражныя і маст. фільмы («Суседзі», 1979, «Белыя росы», 1984, і інш.). Аўтар п'ес «Выбар» (паст. 1979), «Парог» (паст. 1981), «Вечар» (паст. 1983), «Злом» (1989). П'есы «Апошні ўзлёт» (паст. 1982) і «Радавыя» (паст. 1984, Дзярж. прэмія СССР 1985) прысвечаны падзеям Вял. Айч. вайны. Трагедыя «Купала» (1994) увасабляе трагізм міжусобнай барацьбы ў ВКЛ напярэдадні Крэўскай уніі 1385, «Аддуранне» (1994) — фантасмагарычны погляд на эсхаталагічную загадку краю і народа. «Песня пра зубра» (1994) — сцэн. варыяцыя па матывах паэмы М.Гусоўскага. Гіст. асобы ў яго творах не пафасна рамантызаваныя, а людзі, падуладныя моцным пачуццям, часам здольныя памыляцца, але ўнутрана годныя. Пераклаў на бел. мову хроніку У.Шэкспіра «Рычард III». З 1992 старшыня Саюза тэатр. дзеячаў Беларусі.

Тв.: Дыялог: П'есы. Мн., 1987.

Літ.: Савік Л. Каб не астыла цяпло зямлі. Мн., 1984. С. 59—64; Сямёнава А. Слова сапраўднага лад. Мн., 1986. С. 116—131; Ганчароў А. Культ сонца // Беларусь. 1986. № 8. *В.С.Вайткевіч.*

«ДУДА́РЫКІ», бел. сцэнічны мужчынскі танец. Створаны ў 1960-я г. балетмайстрам І.Серыкавым з выкарыстаннем элементаў традыц. нар. лексікі. Муз. памер $^{2}/_{4}$. Тэмп жвавы. Мае гумарыстычны характар, выконваецца любой колькасцю ўдзельнікаў, якія па чарзе саліруюць, імітуючы ігру на дудцы, выяўляючы сваю вынаходлівасць, дасціпнасць, уменне весяліць народ. Насычаны тэхнічна складанымі рухамі.

Літ.: Алексютович Л.К. Белорусские народные танцы, хороводы, игры. Мн., 1978. С. 339—353. *Л.К.Алексютовіч.*

ДУДАРЭ́НКА Леанід Аляксандравіч (н. 25.10.1930, г. Маладзечна Мінскай вобл.), бел. жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1991). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1963). Гал. месца ў творчасці, якой уласцівы метафарычная афарбоўка, багатае вобразнае вырашэнне, займаюць канцэптуальныя сюжэтна-тэматычныя карціны: «П'ета» (1968), «Вызваленне» (1975), «Касінеры Каліноўскага» (1978), «У майстэрні» і «Гэта не павінна здарыцца» (абедзве 1986), «Эпілог» і «Людзі і манументы» (абедзве 1988), «Майму народу гэта кніга (Скарына)» (1990), «Баляванне драпежнікаў» (1993), «Усюды жыццё» (1995), «За што, Госпадзі?» (1996). Пейзажы і партрэты вылучаюцца моцнай пластыкай, выразнасцю малюнка: партрэты В.Быкава (1980), М.Багдановіча (1981), «Перад трэніроўкай. Н.Б.Сініцына» (1987),

Л.Дударэнка. Гэта не павінна здарыцца. 1988.

«Мая Наталля» (1997), пейзажы «Браслаў» (1982), «Раўбічы» (1988), «Пінск» (1993) і інш.

Літ.: Шаура Р. Леанід Дударэнка. Мн., 1984; Леонид Дударенко. Мн., 1995.

ДУДАРЭ́НКА Уладзімір Аляксандравіч (н. 20.7.1934, в. Варатын Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. матэматык. Канд. пед. н. (1980), праф. (1991). Засл. настаўнік Беларусі (1974). Скончыў Мазырскі пед. ін-т (1956). З 1983 рэктар Мазырскага пед. ін-та. Навук. даследаванні па распрацоўцы і ўдасканаленні зместу і структуры матэм. дысцыплін для ВНУ. Аўтар вучэбных дапаможнікаў для тэхнікумаў і ВНУ.

Тв.: Алгебра и геометрия. Мн., 1989 (разам з А.А.Далаянам); Математический анализ. Мн., 1990 (з ім жа).

ДУ́ДЗІН Аляксандр Мікалаевіч (23.7.1953, г. Спаск-Дальні, Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1992). Скончыў БДУ (1976), дзе і працуе. Навук. працы па стахастычных працэсах абслугоўвання ў сістэмах са зменнымі рэжымамі функцыянавання і даследаванні тэлекамунікацыйных сетак.

Тв.: Практикум на ЭВМ по теории массового обслуживания. Мн., 1994 (разам з Г.А.Мядзведзевым, Ю.В.Мелянцом); Расчет характеристик однолинейной системы обслуживания, функционирующей в марковской синхронной случайной среде (разам з В.І.Клімянок) // Автоматика и телемеханика. 1997. № 1.

ДУ́ДЗІН Міхаіл Аляксандравіч (20.11.1916, в. Кляўнёва Іванаўскай вобл., Расія — 31.12.1993), рускі паэт. Герой Сац. Працы (1976). Друкаваўся з 1934. У 1939—45 у арміі. Як паэт сфарміраваўся на фронце (зб-кі «Фляга», 1943, «Пераправа», 1945). Яго паэзія вострапубліцыстычная і аптымістычная, услаўляе чалавека і яго працу (зб-кі «Масты. Вершы з Еўропы», 1958, «Чавук. працы па стахастычных працэсах абслугоўвання ў сістэмах са зменнымі рэжымамі функцыянавання і даследаванні тэлекамунікацыйных сетак.

Тв.: Практикум на ЭВМ по теории массового обслуживания. Мн., 1994 (разам з Г.А.Мядзведзевым, Ю.В.Мелянцом); Расчет характеристик однолинейной системы обслуживания, функционирующей в марковской синхронной случайной среде (разам з В.І.Клімянок) // Автоматика и телемеханика. 1997. № 1.

ДУ́ДЗІН Міхаіл Аляксандравіч (20.11.1916, в. Кляўнёва Іванаўскай вобл., Расія — 31.12.1993), рускі паэт. Герой Сац. Працы (1976). Друкаваўся з 1934. У 1939—45 у арміі. Як паэт сфарміраваўся на фронце (зб-кі «Фляга», 1943, «Пераправа», 1945). Яго паэзія вострапубліцыстычная і аптымістычная, услаўляе чалавека і яго працу (зб-кі «Масты. Вершы з Еўропы», 1958, «Чацвёртая зона», 1960, «Да запатрабавання», 1963, «Дарога жыцця», 1967, «Час», 1969, «Полюс», 1979, і інш.). Аўтар аповесці «Дзе наша не прападала» (1965), кнігі пра л-ру «Поле прыцягнення. Проза пра паэзію» (1981). На бел. мову творы Д. перакладалі Р.Барадулін, С.Грахоўскі, П.Макаль, Ю.Свірка, М.Танк і інш. Дзярж. прэмія СССР 1981.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. Л., 1976—77; Бел. пер. — Пасля спаткання: Выбр. М., 1984.

Літ.: Лавров В.А. Михаил Дудин. Л., 1976; Хренков Д.М. Михаил Дудин. М., 1976.

ДУДЗІ́НКА, горад у Расіі, цэнтр Таймырскай (Даўгана-Ненецкай) аўт. акругі, за Палярным кругам, у нізоўях р. Енісей. Засн. ў 1667 як зімоўе, з 1951 горад. 32,1 тыс. ж. (1992). Марскі порт (аванпорт Нарыльска). Чыг. станцыя (пач. пункт самай паўн. у свеце чыгункі Д.—Нарыльск). Рыбазавод. Краязнаўчы музей.

ДУДЗІ́НСКАЯ Наталля Міхайлаўна (н. 8.8.1912, г. Харкаў, Украіна), руская артыстка балета, педагог. Нар. арт. СССР (1957). Скончыла Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча (1931, педагог А.*Ваганава*), з 1964 выкладае ў ім (цяпер Акадэмія рускага балета). У 1931—62 салістка Ленінградскага т-ра оперы і балета імя Кірава, з 1951 педагог Марыінскага т-ра. Для яе творчасці характэрны віртуозная тэхніка класічнага танца, экспрэсіўная манера выканання, эмацыянальная выразнасць, вытанчаны пластычны малюнак ролі. Сярод лепшых партый: Лаўрэнсія («Лаўрэнсія» А.Крэйна), Гаянэ («Гаянэ» А.Хачатурана), Папялушка («Папялушка» С.Пракоф'ева), Раймонда («Раймонда» А.Глазунова), Сары («Сцежкаю грому» К.Караева), Кітры, Нікія («Дон Кіхот», «Баядэрка» Л.Мінкуса). Дзярж. прэмія СССР 1941, 1947, 1949, 1951.

Н.**Дудзінская** ў ролі Раймонды.

ДУДЗІ́НЦАЎ Уладзімір Дзмітрыевіч (н. 29.7.1918, г. Купянск, Украіна), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі юрыд. ін-т (1940). Друкуецца з 1933. Аўтар зб-каў апавяданняў «У сям'і асілкаў» (1952), аповесцей «На сваім месцы» (1953), «Навагодняя казка» (1960). Раман «Не хлебам адзіным» (1956) пра вынаходніка ў сутыкненні з бюракратамі і прыстасаванцамі незаслужана крытыкаваўся за т. зв. ачарненне рэчаіснасці. Востраскюжэтны раман «Белае адзенне» (1987) пра самаадданую барацьбу вучоных за выратаванне генетыкі як навукі ў канцы 1940-х г.

Тв.: Повести и рассказы. М., 1959; Не хлебом единым. М., 1990.

ДУДЗІ́ЦКІ (сапр. Г у ц ь к а) Уладзімір Ермалаевіч (8.11.1911, в. Дудзічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — ?), бел. паэт. Вучыўся ў Мінскім пед. тэхнікуме, Бел. вышэйшым пед. ін-це. Працаваў у газ. «Савецкая Беларусь», выд-ве АН БССР. У 1933 арыштаваны і прыгавораны да 3 гадоў лагераў. Вярнуўшыся, працаваў у газ. «Віцебскі пралетарый», у школах Віцебска, у вет. тэхнікуме ў Курасоўшчыне (цяпер у межах Мінска). У Вял. Айч. вайну супрацоўнічаў з акупантамі, уваходзіў у склад *Беларускай цэнтральнай рады* (БЦР), *Беларускага культурнага згуртавання*, працаваў у гар. управах Мінска і Барысава. У 1944 у Берліне, дзе працягваў працаваць у БЦР, скончыў курсы ням. прапагандыстаў у Добендорфе. У ліст. 1944 выйшаў з БЦР і прымкнуў да ўласаўцаў. У канцы вайны служыў у прапагандысцкім органе «Вінета» (Мін-ва прапаганды Германіі). У 1960-я г. жыў у Германіі, ЗША, Венесуэле. Па справе за 1933 рэабілітаваны ў 1956. Друкаваўся з 1937. Пісаў вершы, паэмы, фельетоны, апавяданні і інш.

Тв.: У кн.: Туга па Радзіме. Мн., 1992; Напярэймы жаданням. Нью-Йорк, 1994.

ДУ́ДЗІЦКІ МУЗЕ́Й МАТЭРЫЯ́ЛЬНАЙ КУЛЬТУ́РЫ. Заснаваны выдавецкай фірмай «Паліфакт». Адкрыты ў 1994 на тэр. б. маёнтка Ельскіх каля в. Дудзічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Складаецца з комплексу стылізаваных пабудоў 19 — пач. 20 ст.: дзеючага цэха рамёстваў (хлебапякарня, масласыраварня, кузня, ганчарная і дрэваапр. майстэрні), сял. хутара, ветрака, карчмы з заезным домам, экспазіц. залы з прадметамі гасп. абсталявання і прылад працы 18—19 ст., выстаўкі стараж. аўтамаб. тэхнікі, механізмаў па перапрацоўцы збожжа, лёну, прадуктаў жывёлагадоўлі, трансп. сродкаў.

А.М.Карлюкевіч.

ДУ́ДЗІЧ Захар Захаравіч (17.8.1913, в. Шацілы Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне эканомікі. Д-р эканам. н. (1969), праф. (1970). Засл. работнік вышэйшай школы (1972). Скончыў Бел. дзярж. ін-т нар. гаспадаркі (1939). У 1948—53 у БДУ. У 1953—90 у Бел. політэхн. акадэміі, да 1980 заг. кафедры палітэканоміі. Даследуе тэарэт. праблемы развіцця мікра- і макраэканомікі, эканам. адносін паміж рознымі краінамі. Адзін з аўтараў і рэдактар навуч. дапаможніка «Эканамічная тэорыя» (ч. 1—2, 1995).

Тв.: Экономические законы и их использование в строительстве коммунизма. Мн., 1965; Экономические законы социализма в действии. Мн., 1968 (разам з І.І.Самадзеевым); Материальные интересы и экономические законы в развитом социалистическом обществе. Мн., 1978.

ДУ́ДЗІЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Бабруйск—Калінкавічы. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 7 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Калінкавічы, 129 км ад Гомеля. 733 ж., 271 двор (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызана.

ДУ́ДЗІЧЫ, вёска ў Навапольскім с/с Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 50 км ад райцэнтра г. Мар'іна Горка, 40 км ад Мінска, 20 км ад чыг. ст. Рудзенск. 256 ж., 99 двароў (1997).

Упершыню ўпамінаецца ў 1600 у Мінскім пав. ВКЛ. У 1766 атрымала прывілей на 3 кірмашы ў год. У 1769 тут пабудаваны палац і парк, у 1780 — уніяцкая Пакроўская царква (з 1839 правасл.). З 1785 уласнасць *Ельскіх*. З 1793 у складзе Рас. імперыі, у Ігуменскім пав. Мінскай губ. У 1800 у Д. 300 ж., 30 двароў, царква, млын, 3 карчмы, бат. сад, аранжарэя, гарбарны з-д. У 1924—31, 1935—62 цэнтр сельсавета ў Самахвалавіцкім, Смілавіцкім, Рудзенскім, Уздзенскім, у 1931—35 і з 1962 у Пухавіцкім раёнах. Каля вёскі *Дудзіцкі музей матэрыяльнай культуры.*

Базавая школа, б-ка.

ДУДЗЮ́К Зінаіда Іосіфаўна (н. 29.3.1950, в. Слабодка Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.), бел. паэтэса і драматург. Скончыла Брэсцкі інжынерна-будаўнічы ін-т (1977). Працавала на будоўлі, тэхнікам, інжынерам. Друкуецца з 1967. У зб-ках вершаў «Праводзіны птушак» (1983), «Абрысы лета» (1988) роздум над праблемамі маралі, сучаснага духоўнага жыцця. Піша вершы і казкі для дзяцей. Аўтар п'есы для лялечнага тэатра «Канёк-Гарбунок» (1985, паводле казкі П.Яршова), аднаактоўкі «У абдымку вятроў» (1985), радыёп'есы «Дудка-самагудка» (паст. 1989), дзіцячай п'есы «Сінязорка» (1995), драмы «Заложнікі шчасця» (1997). На бел. мову пераклала п'есу Т.Амосавай і І.Пятровай «Славутае качаня Цім» (паст. 1990).

Тв.: Так і не: Вершы. Мн., 1993; Палоннікі жыцця: Аповесці, апавяданні. Мн., 1997.

Літ.: К а л е с н і к У. Зінаіда Дудзюк // Беларусь. 1985. № 7.

ДУДЗЯ́К Аляксандр Іванавіч (н. 23.9.1949, г. Канатоп, Украіна), бел. вучоны ў галіне фізікі і тэхнікі высокага ціску. Д-р тэхн. н. (1992). Скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т (1973). З 1978 у БПА. Навук. даследаванні па праектаванні апаратаў высокага ціску і распрацоўцы тэхнал. працэсаў атрымання штучных алмазаў, кубічнага нітрыду бору і кампазіцыйных матэрыялаў на іх аснове.

Тв.: К вопросу об оптимизации конфигурации камер высокого давления (разам з Г.М.Ждановічам) // Порошковая металлургия. Мн., 1982. Вып. 6. Исследование возможности увеличения стойкости пресс-форм высокого давления (у саўт.) // Техника и технология высоких давлений. Мн., 1990.

ДУ́ДКА, агульная назва нар. духавых муз. інструментаў флейтавага тыпу на Беларусі, Украіне, у Расіі. Падобныя інструменты вядомы з глыбокай старажытнасці ў многіх народаў свету пад рознымі назвамі. Мае выгляд трубкі даўж. 20—30 см з адной свістковай і 5—8 (найчасцей 6) бакавымі іграўымі

адтулінамі; у верхні канец трубкі ўстаўлена свістковае прыстасаванне. Бываюць Д. даўж. да 100 см без бакавых адтулін. Вырабляюцца са ствалоў дрэў розных парод (хвоя, клён, крушына, арэшнік і інш.), кары вярбы і лазы, у апошні час з алюмінію. Маюць мяккі, пяшчотны гук разнастайнай афарбоўкі і сілы ў розных рэгістрах, значныя кантыленныя і тэхн. магчымасці.

На тэр. Беларусі Д. вядома з 1-й пал. 2-га тыс. да н.э. (паводле даных археал. раскопак і літ. помнікаў). У этнагр. працах 19 — 1-й пал. 20 ст. адзначана выкарыстанне Д. ў некат. каляндарна-земляробчых і сямейных абрадах, на гулянках і бяседах. Пра Д. складзены загадкі, казкі, песні; у прафес. паэзіі яна побач з інш. нар. інструментамі выступае як сімвал паэт. душы народа («Мая дудка» Ф.Багушэвіча). У наш час сустракаецца на ўсёй тэр. Беларусі, на ёй іграюць нар. музыканты, Д. ўведзена ў многія прафес. і самадз. творчыя калектывы, ансамблі і аркестры. Навучанне ігры на Д. існуе ў Бел. ун-це культуры.

Літ.: Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые. Мн., 1979.

І.Дз.Назіна.

Дудкі.

ДУДКЕ́ВІЧ Валянцін Уладзіміравіч (н. 6.10.1943, г. Магілёў), бел. танцоўшчык, харэограф. Засл. дз. маст. Беларусі (1986). Скончыў Бел. харэаграфічнае вучылішча (1961), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1981). З 1961 артыст балета Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1969 артыст балета, педагог-рэпетытар, рэжысёр-пастаноўшчык, маст. кіраўнік канцэртна-эстр. бюро Бел. філармоніі. З 1986 маст. кіраўнік — дырэктар *Дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь*. Веданне бел. танц. фальклору і беражлівае стаўленне да яго, вял. творчы патэнцыял і неардынарныя арганізатарскія здольнасці дазволілі яму плённа працаваць у галіне развіцця і папулярызацыі нар. харэаграфічнага мастацтва. Сярод пастановак: канцэртныя праграмы «Свята», «Карагод сяброў», «Вечар памяці С.Дрэчына», бел. нар. танцы «Кола», «Бульба», «Кадрыля на зэдліках», «Вясковыя гульні», «Каляды», «Арэлі», «Церніца», «Вечарына», «Спеў дубраў», «Кабеты і жаўнеры» і інш. У пастаноўках апошніх гадоў стварае танц. нумары з драматург. развіццём у жанры «фольк-балет». Імкнецца працягваць традыцыі прафес. харэагр. мастацтва, закладзеныя *А.Апанасенкам*, *С.Дрэчыным* і інш.

ДУДКО́Ў Дзяніс Аляксандравіч (23.6.1904, г. п. Круглае Магілёўскай вобл. — 23.3.1948), бел. гісторык. Канд. гіст. н. (1935). Скончыў БДУ. З 1931 у Ін-це гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, Ін-це гісторыі АН БССР, БДУ, Мінскім пед. ін-це. Удзельнік Вял. Айч. вайны. Аўтар прац па гісторыі Беларусі 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Даследаваў развіццё капіталізму, рабочы і сял. рух і інш.

Тв.: Столыпінская рэформа ў Віцебскай губерні. Мн., 1931; Аб развіцці капіталізма ў Беларусі ў 2-й палове XIX і пачатку XX ст. Мн., 1932.

Літ.: Михнюк В.Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919—1941 гг.). Мн., 1985.

У.М.Міхнюк.

ДУ́ДНІК (Angelica), род кветкавых раслін сям. сельдэрэевых. Каля 60 відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і, асабліва ва Усх. Азіі. На Беларусі 3 дзікарослыя віды: усюды трапляецца Д. лясны (A. sylvestris), зрэдку — лекавы, або дзягіль (A. archangelica), і вельмі рэдка — балотны (A. palustris). Растуць у лясах, хмызняках, на лугах, балотах і інш. Цэнтр. бат. садам Нац. АН Беларусі як дэкар. расліна інтрадукаваны Д. сахалінскі (A. sachalinensis).

Дуднік лясны.

Двух- або шматгадовыя травяністыя расліны з кароткім карэнішчам і галінастым, унутры пустым — дудкаватым (адсюль назва) сцяблом выш. да 2 м. Лісце буйное, складанае, перыстарассечанае, з вял. похвамі. Кветкі дробныя, белыя ці ружаватыя, у буйных складаных парасоніках. Плод — вісланлодзік з 10 крылатымі рэбрамі. Лек., кармавыя, эфіраалейныя, меданосныя, вострапыпраўныя і дэкар. расліны. Плады і карані багатыя кумарынам.

ДУДО́ Пятро (Пётр Дзмітрыевіч; 4.9.1911, в. Забалацце Лепельскага р-на Віцебскай вобл. — 23.2.1958), бел. пісьменнік. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі ў Мінску (1940). З 1935 у арміі. Друкаваўся з 1934. Выступаў з нарысамі і апавяданнямі. Аўтар аповесці «Першы салют» (1953) і сатыр. камедыі «Чортаў тузін» (1959).

Тв.: Чортаў тузін. Мн., 1963; Першы салют. Мн., 1971.

П.А.Дудчык.

ДУ́ДЧЫК Павел Андрэевіч (12.7.1918, в. Казённыя Паршні Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 17.4.1994), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў артыл. школу (1939), Бранскае ваенна-паліт. вучылішча (1942), Вышэйшую афіцэрскую артыл. штабную школу (1950). У Чырв. Арміі з 1938. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Калінінскім, Паўн.-Зах., 2-м Прыбалт., 1-м і 4-м Укр. франтах. Вызначыўся ў 1944 у баях на тэр. Літвы: артыл. батарэя на чале з капітанам Д. адбіла 11 контратак ворага і прымусіла адступіць. Да 1959 у Сав. Арміі.

ДУ́ЖАЎКА, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл., на р. Проня, на аўтадарозе Чавусы—Слаўгарад. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 21 км на Пд ад г. Чавусы. 62 км ад Магілёва, 17 км ад чыг. ст. Чавусы. 269 ж., 106 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. З брацкія магілы сав. воінаў.

ДУЖ-ДУШЭ́ЎСКІ Клаўдзій Сцяпанавіч, гл. *Душэўскі* К.С.

ДУ́ЖКІ, гл. ў арт. *Знакі прыпынку*.

ДУ́ЗЕ (Duse) Элеанора (3.10.1858, г. Віджэвана, Італія — 21.4.1924), італьянская актрыса. З акцёрскай сям'і. Выступала ў італьян. вандроўных трупах, у 1887 арганізавала ўласную. Шмат гастраліравала па краінах Еўропы і Амерыкі. Актрыса трагічнага плана. Лепшыя ролі: Тэрэза Ракэн («Тэрэза Ракэн» Э.Заля), Маргарыта Гацье («Дама з камеліямі» А.Дзюма-сына), Сантуца («Сельскі гонар» Дж.Вергі), Клеапатра («Антоній і Клеапатра» У.Шэкспіра), Нора («Нора» Г.Ібсена), Мірандаліна («Карчмарка» К.Гальдоні), Ганна («Мёртвы горад» Г.Д'Анунцыо). Дэмакр. і гуманіст. мастацтва Д. вызначалася праўдзівасцю, філігранным майстэрствам.

ДУ́ЙСБУРГ (Duisburg), горад на З Германіі, у зямлі Паўн. Рэйн-Вестфалія, у Рурскім прамысл. раёне. Горад з 12 ст. 536,8 тыс. ж. (1994). Буйнейшы ў свеце рачны порт, на р. Рэйн і канале Рэйн—Герне. Вузел чыгунак і аўтадарог. Важны індустр. цэнтр Рурскага прамысл. раёна. Цэнтр чорнай і каляровай металургіі, цяжкага машынабудавання, рачнога суднабудавання, вытв-сці стальных канструкцый. Прам-сць: нафтахім. і нафтаперапр., вугляхім., харчасмакавая (піваварная, мукамольная, тытунёвая). Маст. музеі.

ДУКА́Т (італьян. ducato ад позналац. ducatus герцагства), агульнаеўрапейская назва залатой манеты, якую з 1284 чаканіла Венецыя. Чаканілі ў Венгрыі і Чэхіі (каля 1325—26), Германіі (сярэдзіна 14 ст.), Польшчы (1320, 1528), ВКЛ (1562). На тэр. Беларусі ў 14—16 ст. найб. пашыраны венгерскі Д., у 16—18 ст. абарачаўся Д. Паўд. Нідэрландаў і Германіі.

Дукат ВКЛ. 1561.

ДУ́КІ-ДЫ-КАШЫ́ЯС (Duque de Caxias), горад на ПдУ Бразіліі, у штаце Рыо-дэ-Жанейра. Горад-спадарожнік г. Рыо-дэ-Жанейра. Засн. ў 16 ст. 664,6 тыс. ж. (1991). Буйны цэнтр нафтаперапр. прам-сці, машынабудавання і каляровай металургіі. Прадпрыемствы хім., фармацэўтычнай, керамічнай, тэкст., харч. прам-сці.

ДУКО́РА, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Свіслач, на аўтадарозе Мінск—Гомель. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 27 км на ПнЗ ад г. Мар'іна Горка, 38 км ад Мінска, 13 км ад чыг. ст. Рудзенск. 1429 ж., 596 двароў (1997).

У 16 ст. ў складзе маёнтка Бакшты ў Мінскім пав., належала Кезгайлам, Служкам, Агінскім і інш. З 1793 у Рас. імперыі, у Ігуменскім пав. Мінскай губ. У 1800 складалася з мястэчка і сяла, мела царкву, яўр. школу, будаваўся мураваны касцёл (у 1864 ператвораны ў правасл. царкву), праводзіліся 4 кірмашы ў год. З 1-й пал. 19 ст. існавала *Дукорская сядзіба*. З 1861 цэнтр воласці, у 1881 мястэчка злілося з сялом, 842 ж. У 1919—20 непадалёку ад Д. дзейнічаў партыз. атрад (гл. *Дукорскія партызаны*). У 1924—60 цэнтр сельсавета ў Смілавіцкім, Пухавіцкім, Рудзенскім, з 1960 у Пухавіцкім р-нах. У 1970 у Д. 2258 ж., 797 двароў.

Філіял Мінскага матацыклетнага і веласіпеднага з-да, дрэваапр. цэх, пякарня. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, помнік землякам, што загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік дукорскім партызанам, якія загінулі ў 1920. Радзіма дзярж. дзеяча А.Р. *Чарвякова*. Помнік архітэктуры — сядзіба (19 ст.).

ДУКО́РСКАЯ СЯДЗІ́БА. Існавала ў 19 — пач. 20 ст. ў в. Дукора Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Належала Оштарпам, з 1874 — Гартынгам. У сядзібны комплекс у стылі класіцызму ўваходзілі палац, касцёл, гасп. пабудовы, парк.

Палац — 2-павярховы мураваны прамавугольны ў плане будынак (пабудаваны ў 19 ст. Л.Оштарпам). Гал. фасад быў аформлены 4-калонным порцікам з трохвугольным франтонам. Да тарцоў былі прыбудаваны 1-павярховыя прамавугольныя ў плане аранжарэі. Палац меў шмат жылых і парадных пакояў, б-ку на некалькі тысяч тамоў, архіў і інш. памяшканні. Была калекцыя твораў выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва (у т.л. карціны Ф.Смуглевіча, Я.Дамеля), існаваў аркестр. Каля палаца стаяў касцёл 18 ст. Зруйнаваны ў гады Вял. Айч. вайны. Захаваліся флігель, уязная брама, фрагменты пейзажнага парку.

Ю.А.Якімовіч.

Дукорская сядзіба. Палац. З малюнка Н.Орды. 19 ст.

ДУКО́РСКІЯ ПАРТЫЗА́НЫ, удзельнікі барацьбы супраць польскіх акупантаў на тэр. Ігуменскага і Мінскага пав. у 1919—20. У кастр. 1919 — крас. 1920 пад кіраўніцтвам Мінскага падп. к-та КП(б)ЛіБ у Дукорскай, Пярэжырскай, Самахвалавіцкай, Сенніцкай і інш. валасцях створаны партыз. групы і атрады (каля 600 чал., кіраўнікі А.А.Блажко, С.Р.Камлюк, Г.Ф.Катлянік, А.А.Крывашчокі і інш.). Партызаны вялі агітработу сярод сялян, псавалі лініі сувязі, выконвалі заданні камандавання Чырв. Арміі. Падпольны к-т сіламі партызан і падпольшчыкаў рыхтаваў у маі 1920 адначасовы ўдар па ворагу ў некалькіх месцах, але гэтаму перашкодзілі праведзеныя дэфензівай 27—28 крас. і ў ноч на 3 мая арышты ў вёсках Козырава, Калядзічы, Гатава, Дукора, Харавічы і інш. Пасля катаванняў паводле прыгавору ваен.-палявога суда 17.5.1920 ва ўрочышчы Пушча (каля в. Дукора) растраляны 11 Д.п.: А.К.Ахрамовіч, Блажко, П.К.Буры, І.І.Камлюк, І.Р.Камлюк, С.Р.Камлюк, Катлянік, Крывашчокі, М.Ф.Маліноўскі, П.С.Пазняк, М.І.Рудовіч. 30 партызан сасланы ў польскія турмы на тэрмін ад 1 да 10 гадоў, дзе 5 з іх загінулі. У в. Пярэжыр і на месцы расстрэлу партызан пастаўлены помнікі.

У.У.Грамовіч.

ДУ́КСА Мар'ян Мікалаевіч (н. 5.4.1943, в. Каракулічы Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1969). Настаўнічае. Друкуецца з 1960. Аўтар зб-каў вершаў «Спатканне» (1967), «Крокі» (1972), «Прыгаршчы сініц» (1976), «Зона супраціўлення» (1982), «Твая пара сяўбы» (1985), «Заснежаныя ягады» (1989, Літ. прэмія імя А.Куляшова 1990), «Горн прымірэння» (1993) і інш., для дзяцей — «Зялёны акварыум» (1980). Прыгажосць Бацькаўшчыны, роднай прыроды, паэзія кахання, праблемы дабра і зла, веры — асн. матывы яго твораў.

Тв.: Валуны на пагорках. Мн., 1994.

Літ.: Стальмахоў В. Паэтычнае слова Мар'яна Дуксы // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн., 1979.

ДУ́КТАЎ Уладзімір Уладзіміравіч (н. 28.12.1953, г. Крычаў Магілёўскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1976). Працаваў у прэсе, на парт. рабоце. З 1994 сакратар Магілёўскага абл. аддз. СП Беларусі. Друкуецца з 1986. Аўтар кн. прозы «Дзякуй і даруй» (1993), «Трэцяя асоба» (1997).

ДУ́ЛАВА Вера Георгіеўна (н. 27.1.1910, Масква), расійская арфістка, педагог. Нар. арт. Расіі (1966), нар. арт. СССР (1976). Дачка скрыпача Г.Дулава. Вучылася ў Маскоўскай кансерваторыі (1920—22 у К.*Эрдэлі*, 1922—25 у М.Карчынскай), з 1943 выкладала ў ёй (праф. з 1958). У 1929—31 салістка Маскоўскай філармоніі, у 1932—84 — аркестра Вял. т-ра. З 1930-х г. гастраліравала, у т.л. за рубяжом. З яе ўдзелам напісана шмат твораў для арфы (у т.л. канцэрты С.Васіленкі, А.Масалова, санаціны Л.Кніпера, А.Балціна, «Усходні танец» А.Хачатурана). Аўтар апрацовак для арфы, у т.л. твораў франц. клавесіністаў і інш., кн. «Мастацтва ігры на арфе» (1975). Сярод вучняў Э.Масквіціна, Н.Шамеева. Дзярж. прэмія СССР 1973.

ДУ́ЛАЎ Андрэй Васілевіч (н. 21.10.1924, С.-Пецярбург), бел. вучоны-юрыст. Д-р юрыд. н. (1964), праф. (1966). Скончыў Усесаюзны завочны юрыд. ін-т (1949). З 1944 следчы пракуратуры Ленінграда. У 1954—58 выкладчык Ленінградскага ун-та. З 1958 у БДУ, у 1966—89 заг. кафедры крыміналістыкі, з 1989 выкладчык гэтай кафедры. Даследуе праблемы тэорыі суд. доказаў і метадалогіі крыміналістыкі, суд. псіхалогіі, суд. экспертыз, навук. арганізацыі дзейнасці следчых органаў. Адзін з аўтараў навуч. дапаможніка па крыміналістыцы (1996).

Тв.: Судебная психология. 2 изд. Мн., 1975; Тактические операции при расследовании преступлений. Мн., 1979; Основы расследования преступлений, совершенных должностными лицами. Мн., 1985.

ДУЛЕ́БА Антон Мікалаевіч (14.1.1920, в. Дубовы Лог Чэрвеньскага р-на Мін-

скай вобл. — 13.12.1983), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Мінскі індустр. тарфяны тэхнікум (1937), курсы мал. лейтэнантаў (1941), Вышэйшую бранятанк. школу (1948), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1954). У Вял. Айч. вайну з 1942 на Паўн.-Зах., Бел., 1-м Бел. франтах. Вызначыўся ў 1945 у баі на тэр. Польшчы: кав. эскадрон на чале са ст. лейтэнантам Д. фарсіраваў Одру, забяспечыў пераправу ўсяго кав. палка; трапіўшы ў акружэнне, арганізаваў прарыў, выратаваў байцоў і зброю. Да 1969 у Сав. Арміі.

А.М.Дулеба.

Р.Дульбека.

Н.У.Думбадзе.

ДУЛЕ́БКА, Дулеба, рака ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. Ольса (бас. р. Дняпро). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 152 км^2. Пачынаецца за 3,7 км на Пн ад в. Ягадка. Цячэ пераважна па забалочаным лесе. Рэчышча каналізаванае на працягу 12 км.

ДУЛЕ́БЫ, аб'яднанне славянскіх плямён, якое ў 6—9 ст. жыло на Валыні, сярэднім Дунаі, у Чэхіі і інш. мясцінах. У 1-й пал. 7 ст. вялі працяглую барацьбу з аварамі, у пач. 10 ст. ўдзельнічалі ў паходзе кн. Алега на Царград. Пасля распаду аб'яднання сфарміраваліся *драўляне*, *валыняне* і *дрыгавічы*. Археал. помнікі Д. — паселішчы і могільнікі з керамікай тыпу Лукі Райкавецкай. На думку В.В.Ключэўскага, Д. былі першым вял. аб'яднаннем, якое заклала аснову ўсх.-слав. дзяржаўнасці. На тэр. Беларусі, на думку М.І.Ермаловіча, Д., магчыма, перасяліліся з Пд або ПдЗ і, пайшоўшы да вусця Бярэзіны, частка іх пайшла ўверх па рацэ і асела ў сярэднім яе цячэнні, на р. Ольса, а другая іх частка перайшла Дняпро і асела ў Пасожжы (р. Дулепа).

Літ.: Третьяков П.Н. Восточнославянские племена. 2 изд. М., 1953; Седов В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982; Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды. Мн., 1990. *Г.В.Штыхаў.*

ДУЛЁЎСКІ ФАРФО́РАВЫ ЗАВО́Д, адно з буйнейшых у Расіі прадпрыемстваў па вырабе быт. і маст. фарфору. Засн. у 1832 у пусташы Дулёва (з 1937 — г. Дзяржынск-Дулёва Маскоўскай вобл.) І.Я.Кузняцовым. У 1889—1917 належаў таварыству М.С.Кузняцова. Вырабы гэтага перыяду выконваліся ў стылі ампір і адрозніваліся выдатнымі маст. якасцямі. З 1930-х г. пераважае размалёўка буйнымі колеравымі плямамі, сталовая пазалота (сталовыя і чайныя сервізы, вазы, блюды). З сярэдзіны 1960-х г. уводзяцца новыя, больш стрыманыя формы пасудзін. Вырабляюцца таксама дэкар. скульпт. кампазіцыі і фігуркі.

ДУЛУ́Т (Duluth), горад на Пн ЗША, у штаце Мінесота, на беразе воз. Верхняе. Каля 100 тыс. ж., з прыгарадамі (у т.л. ў штаце Вісконсін) каля 300 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Гал. порт на Верхнім возеры. Вываз жал. руды, пшаніцы і лесаматэрыялаў. Прам-сць: металургічная, маш.-буд. (судны, буд. машыны, пад'ёмна-трансп. і прамысл. абсталяванне, інструменты і механізмы), харч., дрэваапр., паліграфічная. Ун-т. Музей, маст. галерэя.

ДУЛЬБЕ́КА (Dulbecco) Рэната (н. 22.2.1914, г. Катандзара, Італія), італа-амерыканскі вірусолаг. Чл. Нац. АН ЗША, замежны чл. Лонданскага каралеўскага т-ва і Італьянскай нац. АН. Праф. (1954). Скончыў Турынскі ун-т (1936, Італія). З 1947 у ЗША у Індыянскім ун-це, з 1949 у Каліфарнійскім тэхнал. ін-це, з 1963 і з 1977 у Солкаўскім ін-це біял. даследаванняў, з 1972 нам. дырэктара Лонданскага дзярж. аб'яднання лабараторый па даследаванні рака. Навук. працы па даследаванні механізмаў узаемадзеяння анкагенных вірусаў, якія маюць ДНК, з нармальнымі клеткамі. Эксперыментальна даказаў, што ДНК віруса пранікае ў геном клеткі і становіцца яго часткай. Нобелеўская прэмія 1975 (разам з Д.*Балтымарам* і Х.М.*Тэмінам*).

ДУЛЯЎЦЫ́, вёска ў Роскім пасялковым Савеце Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса. За 36 км на ПнЗ ад Ваўкавыска, 105 км ад г. Гродна, 12 км ад чыг. ст. Рось. 349 ж., 116 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ДУЛЯЎШЧЫ́НСКАЕ РАДО́ВІШЧА ГЛІН, у Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл., каля в. Дуляўшчына. Лінзападобны паклад звязаны з адкладамі шклоўскага міжледавікоўя. Гліны шэрыя, шчыльныя, з рэдкімі праслоямі і гнёздамі гліністага пяску, месцамі пераходзяць у суглінкі і тонкія супескі. Разведаныя запасы 6,7 млн. м^3, перспектыўныя 0,8 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,8—12,4 м, ускрышы (розназярністыя пяскі, марэнныя супескі) 0,2—7,5 м. Гліны прыдатныя для вытв-сці цэменту. *А.П.Шчураў.*

ДУ́МА, назва розных (прадстаўнічых, выбарных, заканад., дарадчых, адм.) устаноў у Расіі. Гл. *Баярская дума*, *Гарадская дума*, *Дзяржаўная дума*.

ДУМБА́ДЗЕ Надар Уладзіміравіч (14.7.1928, Тбілісі — 14.9.1984), грузінскі пісьменнік. Скончыў Тбіліскі ун-т (1950). Друкаваўся з 1948. Першая кніга — зб. гумарыстычных апавяданняў «Вясковы хлапчук» (1958). Раманы «Я, бабуля, Іліко і Іларыён» (1960), «Я бачу сонца» (1962, за абодва прэмія Ленінскага камсамола 1967) прысвечаны жыццю груз. вёскі ў гады Вял. Айч. вайны. У раманах «Сонечная ноч» (1967), «Белыя сцягі» (1972, Дзярж. прэмія Грузіі імя Ш.Руставелі 1975), «Закон вечнасці» (1978, Ленінская прэмія 1980), аповесці «Кукарача» (1980) і інш. разглядае актуальныя сац.-этычныя праблемы Грузіі. Творы адметныя спалучэннем камічнага з драматычным, нац. гумару з глыбокім лірызмам. Асобныя творы экранізаваны, інсцэніраваны. На бел. мову творы Д. перакладалі В.Нікіфаровіч, У.Сіўчыкаў, М.Стральцоў.

Тв.: Бел. пер. — Закон вечнасці. Мн., 1989; Рус. пер. — Романы. М., 1968.

ДУ́МБАРТАН-ОКС КАНФЕРЭ́НЦЫЯ 1944, папярэдняя нарада прадстаўнікоў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, Кітая па пытаннях стварэння *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый* (ААН). Склікана па прапанове СССР у адпаведнасці з дэкларацыяй 4 дзяржаў аб усеагульнай бяспецы, прынятай у 1943 у Маскве (гл. *Маскоўскія нарады 1941, 1943, 1945*). Праходзіла на віле Думбартан-Окс (прыгарад Вашынгтона) у 2 этапы: перагаворы прадстаўнікоў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі (21.8—28.9.1944) і прадстаўнікоў ЗША, Вялікабрытаніі, Кітая (28.9—7.10.1944). На канферэнцыі ўзгоднены асн. палажэнні праекта Статута ААН, аднак з-за рознагалоссяў бакоў засталіся нявырашанымі пытанні аб першапачатковых членах будучай арг-цыі (сав. бок, які прадстаўляў ураджэнец Беларусі А.А.*Грамыка*, прапаноўваў уключыць у лік дзяржаў-заснавальніц ААН усе 16 саюзных рэспублік) і аб парадку галасавання ў Савеце Бяспекі.

Літ.: Снапковский В.Е. Путь Беларуси в ООН, 1944—1945 гг. Мн., 1994.

ДУ́МЛЕР Сяргей Аўтуставіч (13.6.1906, г. Саратаў, Расія — 24.11.1972), бел. эканаміст. Д-р эканам. н. (1972). Скончыў Саратаўскі ун-т (1931). Працаваў выкладчыкам, інжынерам у Маскве, Чэлябінску, Свярдлоўску. З 1962 нам. дырэктара Цэнтр. н.-д. і праектна-тэхнал. ін-та арганізацыі і тэхнікі кіравання, з 1972 у Бел. ін-це нар. гаспадаркі. Распрацоўваў метады выкарыстання выліч. тэхнікі ў планаванні і эканам. аналізе.

Тв.: Автоматизированные системы управления промышленным предприятием. М.,

1966; Управление производством и кибернетика. М., 1969. *М.П.Савік.*

ДУ́МНЫЯ ЧЫНЫ́, службовыя асобы ў Рускай дзяржаве ў канцы 15—17 ст. — *баяры*, *акольнічыя*, думныя дваране і думныя дзякі, якія мелі права ўдзельнічаць у пасяджэннях *Баярскай думы* і ў рабоце думскіх камісій. Д. ч. займалі вышэйшыя пасады пры двары, удзельнічалі ў дыпламат. перагаворах, разбіралі месніцкія спрэчкі і інш.

ДУ́МПЕР (ад англ. dump звальваць), самазвальная машына для перавозкі сыпкіх грузаў на невял. (да 2 км) адлегласці. Мае кузаў, які пры раз'яднанні счэпнага прыстасавання перакульваецца пад дзеяннем грузу. Вызначаецца прадукцыйнасцю, манеўранасцю, магчымасцю працаваць «чаўнаком» (уперад-назад без разваротаў, для чаго аснашчаецца паваротным сядзеннем і дубліраванымі органамі кіравання). Выкарыстоўваецца таксама для адвозкі грунту з тунэляў. Грузападымальнасць да 13,5 т.

ДУ́МПКАР (англ. dump-car), грузавы чыгуначны паўвагон, кузаў якога пры разгрузцы нахіляецца вакол падоўжнай восі ў розныя бакі пнеўматычным або гідраўлічным механізмам. Выкарыстоўваецца для перавозкі руды, вугалю, буд. сыпкіх матэрыялаў па тэрыторыі буйных прадпрыемстваў. Грузападымальнасць да 180 т.

ДУ́МЫ, ліра-эпічны жанр украінскай нар. паэт. творчасці 15—17 ст. Узніклі ў перыяд разгортвання барацьбы ўкр. народа супраць іназемных захопнікаў і адыгралі значную ролю ў развіцці яго культуры і л-ры, вуснай творчасці і муз. мастацтва. Ім уласцівы ўстойлівая кампазіцыйнасць, разгорнуты сюжэт, імправізацыйнасць, адсутнасць строф. Выконваліся пераважна прафес. нар. спевакамі — *кабзарамі* ці бандурыстамі меладычнай дэкламацыяй-рэчытатывам, пад акампанемент кобзы, бандуры. Тэмы, ідэі, вобразы, некат. асаблівасці паэтыкі Д. выкарыстоўвалі К.Рылееў, Т.Шаўчэнка, І.Франко, П.Тычына і інш.

ДУН, умацаванне або ўмацаванае жыллё ў Ірландыі і Шатландыі ў выглядзе каменнай вежы. Першапачаткова так называлі ў паўн. Шатландыі высокія вежы, пабудаваныя *піктамі* на ўзбярэжжы мора. Найб. стараж. помнікі, верагодна, належаць да жал. веку, але шмат Д. пабудавана ў раннехрысціянскі перыяд і сярэднія вякі.

ДУНАЕ́ЎСКІ Ісак Восіпавіч (30.1.1900, г. Лохвіца, Украіна — 25.7.1955), рас. кампазітар. Нар. арт. Расіі (1950). Скончыў Харкаўскую кансерваторыю (1919). Кіраўнік муз. часткі Маскоўскага т-ра сатыры (з 1924), муз. кіраўнік і гал. дырыжор Ленінградскага мюзік-хола (1929—34). Старшыня Ленінградскага аддзялення Саюза кампазітараў (1937—41). Адзін са стваральнікаў і буйнейшы майстар масавай песні. Меладычны дар і высокі прафесіяналізм абумовілі папулярнасць яго песень 1930—50-х г. («Песня аб Радзіме», «Мая Масква», «Марш вясёлых рабят», «Марш энтузіястаў», «Школьны вальс», «Ляціце, галубы»). Зрабіў вял. ўклад у развіццё жанру аперэты, найб. вядомыя «Залатая даліна» (1937), «Вольны вецер» (1947, паст. ў Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі ў 1971), «Белая акацыя» (1955).

І.В.Дунаеўскі.

Адзін з пачынальнікаў жанру муз. кінакамедыі, аўтар музыкі да кінафільмаў «Вясёлыя рабяты» (1934), «Варатар», «Цырк», «Дзеці капітана Гранта» (усе 1936), «Волга-Волга» (1938), «Светлы шлях» (1940), «Вясна» (1947), «Кубанскія казакі» (1949), а таксама бел. «Першы ўзвод» (1933), «Двойчы народжаны» (1934), «Залатыя агні» (1935), «Шукальнікі шчасця» і «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (1936), «Канцэрт Бетховена» (1937), «Маё каханне» (1940), дакумент. «10 год Белдзяржкіно» (1936). Быў дырыжорам і гукамантажорам бел. фільмаў, у т.л. «Паручнік Кіжэ» з муз. С.Пракоф'ева. У сваю музыку ўключаў інтанацыі бел. нар. песень, гучанне жалейкі, стварыў апрацоўку бел. нар. песні «Бульба». Дзярж. прэмія СССР 1941, 1951.

Літ.: Пэн А. И.Дунаевский. М., 1956; И.О.Дунаевский: Выступления, статьи, письма. Воспоминания. М., 1961; Чернов А. И.О.Дунаевский. М., 1961; Бондарева Е.П. Кинолента длиною в жизнь. Мн., 1980. С. 47, 56—66; Арканов Б. Дунаевский // Музыка XX в. М., 1984. Ч. 2, кн. 4.

ДУНАЁК, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Грэза. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 24 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Быхаў, 68 км ад Магілёва. 507 ж., 204 двары (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ДУНА́Й (ням. Donau, венг. Duna, славацк., чэш. Dunaj, балг., сербск. Дунав, рум. Dunărea), стараж.-грэч. Істр, рака ў Еўропе, на тэр. ФРГ, Аўстрыі, Славакіі, Венгрыі, Югаславіі, Балгарыі, Румыніі, Украіны; другая па даўжыні пасля Волгі. Даўж. 2850 км, пл. бас. 817 тыс. км^2. Утвараецца ад сутокаў Брэге і Брыгах на ўсх. схілах горнага масіву Шварцвальд, упадае ў Чорнае м. Верхні Д. (да Вены) цячэ па Баварскім пласкагор'і ў вузкай глыбокай даліне, якая падзяляе адгор'і Альпаў і Чэшскага масіву. У сярэднім цячэнні перасякае Сярэднедунайскую раўніну. У асобных горных хрыбтах і градах (Венгерскія Вароты, Вішаградскі праход, Жалезныя Вароты, Казанэ) утварае даліны прарыву. Ніжняе цячэнне (да вусця) праходзіць па Ніжнедунайскай раўніне. Утварае дэльту (пл. 3500 км^2), дзе вылучаюцца 3 гал. рукавы (гірлы): Кілійскае, Сулінскае і Георгіеўскае. Больш за 300 прытокаў, 34 з іх суднаходныя. Гал. прытокі: Марава, Ціса, Олт, Сірэт, Прут (злева), Ін, Драва, Сава, Марава (справа). Жыўленне мяшанае. Рэжыму верхняга Д. характэрна летняе разводдзе ад раставання снегу і лёду ў гарах, на астатняй тэр. веснавое разводдзе і летняя межань. На асобных участках у суровыя зімы замярзае да 1,5 мес. Сярэдні гадавы расход вады 6430 м^3/с. Рыбалоўства (пераважна ў дэльце). Водзяцца бялуга, сяўруга, асетр, дунайскі селядзец, сазан, жэрах і інш. Выкарыстоўваецца на арашэнне і водазабеспячэнне гарадоў і прамысл. цэнтраў. Суднаходная да вярхоўяў, мае вял. значэнне ў трансп. сувязях Цэнтр. і Паўд.-Усх. Еўропы. У ніжнім цячэнні (у Румыніі) Д. злучаны каналам з Чорным м. У Жалезных Варотах (на мяжы Румыніі і Югаславіі) 2 буйныя ГЭС (Джэрдап), каскад ГЭС з вадасховішчамі на тэр. Аўстрыі і ФРГ. Гал. гарады на Д. — Рэ-

Рака **Дунай** у Будапешце.

генсбург (ФРГ), Лінц, Вена (Аўстрыя), Браціслава (Славакія), Будапешт (Венгрыя), Нові-Сад, Бялград (Югаславія), Русе (Балгарыя), Брэіла, Галац (Румынія), Ізмаіл (Украіна) і інш. У дэльце Д. запаведнік Дунайскія плаўні. Д. — міжнар. рака. Канвенцыяй аб рэжыме суднаходства на Д. 1948 устаноўлена свабода суднаходства, забаронена плаванне ваен. караблёў непрыдунайскіх краін.

ДУНА́ЙСКАЕ ЗЛЕДЗЯНЕ́ННЕ, назва найстаражытнейшага зледзянення ў Альпах, якое адбылося ў канцы пліяцэну або пач. плейстацэну (каля 1,5—1,8 млн. гадоў назад).

ДУНА́ЙСКАЯ КУЛЬТУ́РА, ліней-на-стужачнай керамікі культура, археалагічная культура плямён эпохі неаліту (5—3-е тыс. да н.э.), якія жылі ў бас. Дуная. У 4500—4000 г. да н.э. распаўсюдзілася ў Зах. і Цэнтр. Еўропе. Больш за 40 помнікаў Д.к. вядомы на З Валыні, яе ўплывы і знаходкі сустракаюцца ў паўд.-зах. Беларусі. Насельніцтва Д.к. займалася земляробствам і жывёлагадоўляй. Жыллё — паўзямлянка, у зах. ч. арэала — наземнае слупавой канструкцыі. Пахавальны абрад — трупаспаленне. Для Д.к. характэрны шарападобныя гаршкі з цыліндрычным горлам, крамянёвыя нажы, скрабкі, пласціны для сярпоў, наканечнікі стрэл, каменныя зерняцёркі, сякеры і інш. Д.к. ўплывала на *нёманскую культуру*. *У.Ф.Ісаенка.*

ДУНА́ЙСКАЯ МАНА́РХІЯ, адна з назваў *Аўстра-Венгрыі*.

ДУНА́ЙСКАЯ ШКО́ЛА ў мастацтве, кірунак у жывапісе і графіцы паўд. Германіі і Аўстрыі 1-й пал. 16 ст. Да Д.ш. адносяць раннія творы Л.*Кранаха* Старэйшага, А.*Альтдорфера*, В.Губера і інш., якія вылучаюцца свабодай маст. фантазіі, эмацыянальнасцю, пантэістычным, падчас казачным успрыманнем прыроды, цікавасцю да лясного і рачнога пейзажу, да прасторы і святла, дынамічнай, парывістай манерай пісьма (часам дробнымі мазкамі), вострай выразнасцю малюнка і інтэнсіўнасцю колеру. Познагатычныя традыцыі пераплятаюцца ў Д.ш. з рэнесансавымі тэндэнцыямі.

ДУНА́ЙСКІЯ КНЯ́СТВЫ, пашыраная ў гіст. л-ры агульная назва княстваў *Малдова* і *Валахія*, якія існавалі ў 14 — сярэдзіне 19 ст. Пасля іх аб'яднання (1859) узнікла новая дзяржава пад назвай *Румынія* (з 1861).

ДУ́НДЗІН Мікалай Мікалаевіч (н. 28.10.1950, в. Чырвоны Бор Чавускага р-на Магілёўскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыў маст.-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1971). Адзін з заснавальнікаў творчага аб'яднання «Квадрат» (1987). Сярод асн. твораў: серыі «Ікар» (1975—77), «Гараскоп» (1985), «Індыйскі цыкл» (1989—95), «Хрысціянскі цыкл» (1989), «Час збіраць камяні» (1992—93), трыпціх «Веліч» (1993), дыпціх «Песня песняў Саламонавых» (1996) і інш. Пераважаюць філас.-метафарычныя і сімвалічныя вобразы, біблейскія і гіст. матывы, складаная архітэктоніка, спалучэнне рэальных і ўмоўных форм. Творам уласціва экспрэсіўнасць і чысціня колеру. Аўтар экспазіцый у Бярэзінскім запаведніку (1983), віцебскіх музеях, маст. афармлення Палаца шлюбаў у Барысаве (1996). *М.Л.Цыбульскі.*

ДУ́НДЗІЧ Алека (сапр. Чоліч Мілуцін; 13.4.1896, паводле інш. звестак 12.8.1897, с. Грабавец, Харватыя — 8.7.1920), адзін з камандзіраў Чырв. Арміі ў грамадз. вайну ў Расіі. Харват. Удзельнік 1-й сусв. вайны (быў у аўстра-венг. арміі), у 1916 трапіў у рас. палон. З кастр. 1917 у Чырв. гвардыі, з 1918 у Чырв. Арміі. У грамадз. вайну ваяваў на камандных пасадах у кавалерыі (у т.л. памочнік пры камандуючым 1-й Коннай арміяй С.М.Будзённым) пераважна на тэр. Украіны. Загінуў у баі каля г. Роўна.

ДУНЕ́Ц Хацкель Майсеевіч (студз. 1897, г. Слонім Гродзенскай вобл. — 29.10.1937), яўрэйскі крытык і публіцыст. Працаваў у Віцебску на парт. рабоце. З 1926 у Мінску: нам. рэдактара газ. «Акцябэр» («Кастрычнік»), адказны рэд. газ. «Літаратура і мастацтва». У 1930—34 нам. наркома асветы БССР. У 1936 рэпрэсіраваны. Зняволенне адбываў на ухтпячорскіх лагерах. Расстраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1967. Даследаваў яўр. л-ру, пісаў пра бел. пісьменнікаў («Аб масавай рабоце на яўрэйскай мове», 1929, «У змаганнях», 1931, «За Магнітабуд літаратуры», 1932, «Пра пісьменнікаў і творы», 1933, «На літаратурныя тэмы», 1934, і інш.).

ДУНІКО́ЎСКІ (Dunikowski) Ксаверы Францішак (24.11.1875, г. Кракаў, Польшча — 26.1.1964), польскі скульптар, мастак. Скончыў Кракаўскую АМ (1903), з 1930 яе прафесар. Прафесар Дзярж. вышэйшай школы пластычных мастацтваў у Вроцлаве (з 1959). Творчасць Д. зазнала ўплыў сімвалізму (цыкл «Чалавек», 1898—1905), кубізму («Надмагілле Баляслава Смелага», 1917—20). Майстар партрэтаў (А.Міцкевіч, 1908, і інш.). У 1925—29 выканаў для Вавельскага замка ў Кракаве серыю «Вавельскія галовы». У 1940-я г. стварыў «Пантэон польскай культуры». Аўтар помніка Ю. Дзятлу ў Кракаве (1937—39), мемар. манументаў «Помнік паўстанцам» каля г. Аполе (1946—52), «Помнік вызвалення зямлі Варміньскай і Мазурскай» у Ольштыне (1949—53). Дзярж. прэміі Польшчы 1948, 1955.

ДУНІ́ЛАВІЦКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў 1921—25 у Зах. Беларусі ў складзе Польшчы. Спачатку ў Навагрудскім, з 1922 у Віленскім ваяв. Падзяляўся на гміны. Цэнтр — г. Дунілавічы. У сувязі з пераносам пав. цэнтра перайменаваны ў *Пастаўскі павет*.

ДУНІ́ЛАВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка на тэр. Беларусі ў 1940—60. Утвораны 15.1.1940 у Вілейскай вобл. Пл. 900 км². 366 нас. пунктаў (1946). Цэнтр — г.п. *Дунілавічы*. 12.10.1940 раён падзелены на 14 сельсаветаў: Ваўкалацкі, Варапаеўскі, Галбейскі, Гулідаўскі, Дунілавіцкі, Жуперскі, Заўлецкі, Казлоўшчынскі, Ласіцкі, Міхайлаўскі, Мосарскі, Сяргеевіцкі і Тузбіцкі. З 20.9.1944 раён у складзе Полацкай, з 3.8.1954 Маладзечанскай абласцей. 20.1.1960 раён скасаваны, яго тэр. далучана да Глыбоцкага р-на.

М.Дундзін. «Я прыйшоў у сад мой...» З дыпціха «Песня песняў Саламонавых». 1996.

К.Дунікоўскі. Адам Міцкевіч. З серыі «Вавельскія галовы». 1925—29.

ДУНІ́ЛАВІЦКІ ТРО́ІЦКІ КАСЦЁЛ ДАМІНІКА́НЦАЎ, помнік архітэктуры позняга барока. Засн. ў 1683 па фундацыі Е.Белазор у в. Дунілавічы Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Да 1766 існаваў драўляны касцёл. Мураваны будынак узведзены ў 1769—73 пры 2-павярховым кляштары дамініканцаў (не збярогся). У 1866 пераабсталяваны пад праваслаўную царкву (з 1919 зноў касцёл).

Мураваная 3-нефавая 2-вежавая базіліка. У аздабленні фасадаў выкарыстаны плоскія пілястры (на галоўным — падвойныя ўвагнутыя), прафіляваныя цяглі, раскрапоўкі, валюты і інш. У інтэр'еры цэнтр. неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі на падпружных арках, бакавыя — крыжовымі.

Скляпенні аздоблены фрэскавай размалёўкай у выглядзе расліннага арнаменту і картушаў.

Т.В.Габрусь.

ДУНІ́ЛАВІЧЫ, вёска ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., на правым беразе р. Галбіца, каля аўтадарогі Полацк—Вільнюс. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 27 км на У ад Паставаў, 223 км ад Віцебска, 9 км ад чыг. ст. Варапаева. 793 ж., 334 двары (1997).

Упамінаецца ў 1473 як уладанне кн. А.Ю.Гальшанскага. У 1556 мястэчка Ашмянскага пав. Віленскага ваяв. У 1567—77 належалі М.К.Радзівілу, пазней Я.Дз.Долмат-Ісайкоўскаму і яго нашчадкам. У 1624 у Д. заснаваны драўляны, у 1684 — мураваны касцёлы, у 1683 — дамініканскі кляштар. З 1793 у Рас. імперыі, у Віленскім пав. У 1800 — 564 ж., 101 двор. З 1861 — цэнтр воласці, у канцы 19 ст. каля 900 ж. З 1921 у Польшчы, цэнтр *Дунілавіцкага павета*. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 гар. пасёлак, цэнтр *Дунілавіцкага раёна*. У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі загубілі ў Д. 828 чал., спалілі больш за палову дамоў. З 1950 цэнтр сельсавета, з 1954 вёска ў Дунілавіцкім, з 1960 у Глыбоцкім, з 1962 у Пастаўскім р-нах. 781 ж., 246 двароў (1971).

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — *Дунілавіцкі Троіцкі касцёл дамініканцаў*.

ДУ́НІН-МАРЦІНКЕ́ВІЧ Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч; 4.2.1808, фальварак Панюшкавічы, Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. — 29.12.1884), паэт, драматург, класік бел. л-ры 19 ст. Лічыцца, што ў 1824 скончыў Бабруйскае пав. вучылішча, працягваў вучобу ў Пецярбургу пад апекай сваяка С.І.*Богуш-Сестранцэвіча*. З 1828 каморнік Мінскага межавога суда, служачы палаты крымінальнага суда, перакладчык пры каталіцкай духоўнай кансісторыі. У 1840 набыў маёнтак Люцынка (Люцінка, Валожынскі р-н) і пакінуў дзярж. службу. У час паўстання 1863—64 паліцыя прыпісвала Д.-М. аўтарства антыўрадавых выданняў (напр., *«Гутаркі старога дзеда»*). З кастр. 1864 да снеж. 1865 зняволены ў мінскую турму, потым быў пад наглядам паліцыі (зняты ў 1872—74, зноў устаноўлены ў 1876), яго дачка Каміла з 1863 адбывала ссылку ў Салікамску. Як драматург і акцёр дэбютаваў у Мінску, паставіўшы аперэту «Рэкруцкі яўрэйскі набор» (1841) і выканаўшы ў ёй адну з гал. роляў. У 1846 апубл. муз.-драм. твор «Сялянка» («Ідылія»), у якім сяляне гавораць па-беларуску. Опера была паст. 9.2.1852 на мінскай сцэне створаным ім тэатр. калектывам (гл. *Дуніна-Марцінкевіча тэатр*; паўторна паст. ў Мінску ў 1994). Д.-М. выконваў ролю Навума Прыгаворкі (адсюль яго псеўданім). Першыя вядомыя паэт. творы Д.-М. на польск. мове («Малітва на памінальны дзень», «Дзіця і маці», «Вясна») прасякнуты сентыменталізмам і рэліг. матывамі. У 1850-я г. распрацоўваў новыя жанравыя формы — вершаванае апавяданне і аповесць, баладу, вытрыманыя ў павучальна-дыдакт. духу («Вечарніцы», «Гапон», 1855, «Купала», 1855, «Шчароўскія дажынкі», 1857, «Травіца брат-сястрыца» і «Быліцы, расказы Навума», нап. 1857). У гэтых творах сплавіліся рамант. цікавасць да нар. звычаяў, традыцый і рэаліст. імкненне перанесці на грунт рэальнага жыцця матывы, вобразы нар. легенд, казак, паданняў. У творчасці Д.-М. сфарміраваўся своеасаблівы метад рамант. этнаграфізму, які адпавядаў пач. этапу развіцця бел. л-ры 19 ст. Адыход ад сентыментальна-ідылічных форм і жанраў выявіўся ў структуры вершаваных твораў, іх вострай канфліктнасці, імкненні вылучыць на першы план маральна-бытавую праблематыку, у спробах асэнсаваць некат. надзённыя з'явы сац.-гіст. рэчаіснасці. У «Стаўроўскіх дзядах» (2-я ч. «Вечарніц») побач са звычаёвымі рэаліямі выразна гучаць агульнагуманіст. і сац. матывы. Ідэя маральнай чысціні народа выяўлена ў вершаванай аповесці «Купала». З пазіцый нар. этыкі зыходзіў аўтар і ў паэме «Гапон», паказаўшы барацьбу героя за асабістае шчасце, шырыню яго натуры, моцнае пачуццё чалавечай годнасці. У творы адлюстраваны і характэрныя сац.-псіхал. з'явы часу — нарастанне стыхійнага бунту сялян, трагедыя рэкрутчыны, маральны заняпад феад. грамадства. Этнагр.-бытавая праблематыка вызначальная і для вершаванай аповесці «Шчароўскія дажынкі», вершаванага апавядання «Быліцы, расказы Навума», балады «Травіца брат-сястрыца» і інш. У іх асн. матывіроўкай паводзін і ўчынкаў сталі нар. крытэрыі працавітасці і сумленнасці чалавека. Паэтызацыя земляробчай працы, узвышэнне чалавека з народа — сведчанне сувязі творчасці пачынальніка бел. л-ры з перадавымі традыцыямі слав. л-р, глыбокага дэмакратызму яго эстэтыкі. У «Быліцах, расказах Навума» п'янства, маральная разбэшчанасць матывуюцца адмоўным уплывам феад. культуры. Ідэя абнаўлення жыцця на больш гуманных, дэмакр. прынцыпах выразна выяўлена ў «Халімоне на каранацыі» (нап. 1857, апубл. 1946). Твор праўдзіва адлюстраваў супярэчнасці ў свядомасці сял. масы напярэдадні рэформы 1861: нягледзячы на расчараванне спадарожнікаў Халімона пасля каранацыі, у іх усё ж застаецца вера ў «добрага» цара. У распрацоўцы жанру балады паэт апіраўся на багатыя традыцыі рамантызму слав. л-р, яе вытокі бачыў у нар. творчасці. Пра шырыню і плённасць творчых інтарэсаў Д.-М. сведчаць яго вершаваныя апавяданні на польскай мове, прысвечаныя актуальным з'явам грамадскага жыцця («Благаславёная сям'я», 1856), гіст. падзеям («Славяне ў XIX стагоддзі», 1856, «Люцынка, або Шведы на Літве», нап. 1857). Пра арыентацыю на здабыткі

В.Дунін-Марцінкевіч.

А.Дункан.

А.Міцкевіча і яго рамант. школы сведчаць і творы на польск. мове, і пераклад Д.-М. на бел. мову «Пана Тадэвуша» (1859), забароненыя царскай цэнзурай (выйшлі толькі 2 «быліцы»). У камедыі «Пінская шляхта» (аўтарскае вызначэнне: фарс-вадэвіль, нап. 1866, апубл. 1918) аўтар выкрывае паразітычную сутнасць царскага чыноўніцтва. Тут многа камедыйна-бытавых сцэн, дзеянне часта суправаджаецца песнямі і танцамі, але вядучыя прынцыпы — сатыр. выкрыццё «чыноўных п'явак». Высмейваецца каставая абмежаванасць пінскай шляхты. Сатыр. камедыя «Залёты» (нап. 1870, апубл. 1918) напісана ў традыцыях двухмоўя і прысвечана праблеме расслаення парэформеннай вёскі. У цэнтры п'есы вобраз вясковага гандляра Антона Сабковіча, асн. прынцыпы якога індывідуалізм, цынічны разлік, эгаізм. Творчае станаўленне Д.-М. складанае. Ён паэтызаваў жыццё і побыт селяніна як носьбіта высокіх маральных і эстэт. каштоўнасцей, што садзейнічала нараджэнню новых дэмакр. ідэй у бел. л-ры. Вял. заслуга Д.-М. ў развіцці бел. літ. мовы, сілабічнага вершаскладання, у выпрацоўцы новых жанрава-стылістычных форм (ідылія, вершаванае апавяданне і аповесць, балада, камедыя). Імя пісьменніка прысвоена Магілёўскаму абл. тэатру драмы і камедыі ў Бабруйску.

Тв.: Творы. Мн., 1984.

Літ.: Купала Я. Памяці Вінцука Марцінкевіча // Зб. тв. Мн., 1973. Т. 2; Багдановіч М. Белорусское возрождение // Поўны зб. тв. Мн., 1995. Т. 2; Семяновіч А.А. Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961; Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963; Яго ж. Героі і музы. Мн., 1982; Яго ж. Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: Спроба навук. сістэматызацыі дак. і матэрыялаў. Мн., 1988; Грынчык М.М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. Мн., 1969; Пачынальнікі: З гісторыка-літ. матэрыялаў

XIX ст. Мн., 1977; Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1. 2 выд. Мн., 1989; Гісторыя беларускай літаратуры, XIX — пачатак XX ст. Мн., 1981; Янушкевіч Я.Я. Беларускі Дудар: Праблема слав. традыцый і ўплываў у творчасці В.Дуніна-Марцінкевіча. Мн., 1991; Навуменка І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Мн., 1992. *М.М.Грынчык.*

ДУ́НІНА-МАРЦІНКЕ́ВІЧА ТЭА́ТР, першы бел. тэатр. калектыў, створаны В.І.*Дуніным-Марцінкевічам*. Існаваў у 1840—50-я г. Наследаваў нар. традыцыі мастацтва, вызначаўся дэмакратызмам, абуджаў нац. самасвядомасць у гледачоў, пакінуў прыкметны след у гісторыі бел. сцэн. мастацтва, садзейнічаў яго станаўленню і развіццю. Выступаў пераважна ў фальварку Дуніна-Марцінкевіча Люцынка (каля Івянца), у Мінску, Бабруйску, Глуску і інш. У 1852 дзейнасць калектыву была забаронена ўладамі, і ён паказваў спектаклі фактычна нелегальна да 1856. Выступленні прымяркоўваліся да свят і ўрачыстасцей, для гэтага пісьменнік спецыяльна пісаў новую п'есу (большасць не збераглася). У спектаклях ужываліся рус., бел. і польск. мовы. У Мінску паказаны «Рэкруцкі яўрэйскі набор» (1841) і «Сялянка» («Ідылія», 9.2.1852; у ролях Іагана Бенатана і Навума Прыгаворкі раскрыўся яркі камедыйны талент Дуніна-Марцінкевіча). У трупу (больш за 20 чалавек) уваходзілі Дунін-Марцінкевіч, яго дочкі Каміла і Мальвіна, сын Міраслаў, К.Кжыжаноўскі, Ляўданскі, Лопат, Кабылінскі, Прушынскі і інш., хор сялян з Люцынкі. Быў аркестр.

ДУНІ́Т (ад назвы гары Дун у Новай Зеландыі), інтрузіўная ультраасноўная поўнакрышт. горная парода, якая складаецца амаль цалкам (на 85—100%) з аліві́ну; мае таксама акцэсарны хромшпінелід; у рознай ступені серпентызаваная. Колер светла-зялёны, цёмна-зялёны да чорнага. Шчыльн. 3280 кг/м^3. Д. вельмі пашыраны, звычайна ўтварае паралельныя лінзы, сілы, сякучыя трубкі (напр., паясы Д. на Урале). З Д. звязаны буйнейшыя радовішчы хромавых руд і плаціноідаў. Выкарыстоўваецца для вытв-сці вогнетрывалых матэрыялаў, дунітавыя пяскі — у ліцейнай вытв-сці.

ДУНКА́Н (Duncan) Айседора (Ізадора; 27.5.1877, г. Сан-Францыска, ЗША — 14.9.1927), амерыканская танцоўшчыца, адна з заснавальнікаў *танца мадэрн*. У танцы выкарыстоўвала стараж.-грэч. пластыку (элементы хады, бегу на паўпальцах, лёгкія скокі, выразныя жэсты), танцавала ў хітоне, без абутку (адсюль назвы «басаножка», «танец басаножак»). Валодала вял. талентам пантамімічнай актрысы і імправізатара. Мастацтва Д. рабіла вял. эмацыянальнае ўздзеянне на гледачоў. У рэпертуары «Марсельеза», «Інтэрнацыянал», танцы на муз. Л.Бетховена, Ф.Шапэна, П.Чайкоўскага. Выступала супраць школы класічнага танца, выпучала прынцып агульнадаступнасці танц. мастацтва, прапагандавала развіццё масавых школ. Заснавала школы ў Германіі (1904), Францыі (1912), ЗША (1915). У 1921—24 жыла ў Расіі, арганізавала ўласную студыю ў Маскве. Была жонкай С.*Ясеніна*. Яе творчасць зрабіла вял. ўплыў на мастацтва сучасных харэографаў, у тл. М.*Фокіна*, А.*Горскага*, К.*Галяйзоўскага*.

Літ. тв.: The dance. New York, 1909; Рус. пер. — Танец будущего. М., 1930; Моя исповедь. Мн., 1994.

Літ.: Seroff V. The real Isadora: A biography. New York, 1971.

ДУНС СКОТ (Duns Scotus) Іаан (каля 1266, Дунс, каля г. Берык-апон-Туід, Вялікабрытанія — 8.11.1308), сярэдневяковы тэолаг, філосаф. Заснавальнік новай францысканскай школы. Вучыўся і выкладаў у Оксфардзе, Парыжы, Кёльне. Яго вучэнне (скатызм) процістаяла дамініканскай схаластыцы — тамізму. Імкнуўся аддзяліць філасофію ад тэалогіі, розум ад веры, даказваў немагчымасць рацыяналістычнага абгрунтавання тэалагічных ідэй стварэння з нічога. Адно з цэнтр. палажэнняў яго вучэння — свабода волі, сцвярджаў прымат волі над інтэлектам. У пазнанні лічыў галоўнай пачуццёвую інтуіцыю, на аснове якой інтэлект стварае індывід. вобраз рэчы, у працэсе абстракцыі ўтвараецца агульнае паняцце.

ДУНТЫНХУ́, возера на У Кітая, на Цзянханьскай раўніне, у даліне р. Янцзы. Пл. ад 4—5 тыс. км^2 зімой (распадаецца на некалькі вадаёмаў) да 10—12 тыс. км^2 летам; сезонныя ваганні ўзроўню 10—15 м. Глыб. да 8 м. У возера ўпадаюць рэкі Сянцзян, Юаньцзян, Лішуй, Цзышуй і інш., рэгулюе сцёк р. Янцзы (з якой злучана рукавамі), прымае ўлетку 40—60% яе паводкавых вод. Суднаходства, рыбалоўства.

ДУ́ПЕЛЬ (Gallinago media), птушка сям. сяўцовых атр. сеўцападобных. Пашыраны ў Еўропе і Паўн. Азіі на балотах і заліўных лугах. Пералётны. На Беларусі звычайны, нар. назва дубельт.

Даўж. цела да 35 см, маса да 230 г. Апярэнне стракатае, рыжавата-бурае. Падобны на бакаса, але на баках грудзей і брушка папярочныя стракаціны, больш кароткая дзюба (да 7,4 см). Самцы такуюць вял. групамі ўначы. Гнёзды на купінах. Нясе 4 яйцы. Птушаняты вывадкавыя. Корміцца глебавымі беспазваночнымі, насякомымі і іх лічынкамі, карэньчыкамі балотных раслін. Зімуе ў Паўд.-Зах. і Паўд. Афрыцы. Аб'ект палявання.

Дупель.

ДУ́ПЛЕКСНАЯ СУ́ВЯЗЬ, сістэма двухбаковай *электрасувязі* паміж двума абанентамі па адной фіз. лініі (аднаму каналу сувязі) з адначасовай перадачай паведамленняў у абодвух напрамках. Гл. таксама *Сімплексная сувязь*.

ДУ́ПЛЕКС-ПРАЦЭ́С у металургіі, працэс вытворчасці сталі або чыгуну паслядоўна ў двух агрэгатах. У сталеплавільнай вытв-сці выкарыстоўваюць Д.-п. *мартэнаўская печ — дугавая печ*, *канвертар — электрычная печ*, індукцыйная вакуумная печ — дугавая вакуумная печ і інш., у чыгуналіцейнай вытв-сці *вагранка* — эл. печ. Пры Д.-п. выкарыстоўваюцца перавагі кожнага з плавільных агрэгатаў.

ДУПЛІКА́ЦЫЯ (ад лац. duplicatio падваенне), разнавіднасць *храмасомнай перабудовы*, у выніку якой узнікае паўтарэнне ўчастка гена ці храмасомы. Паводле Д. гетэразіготныя арганізмы нясуць 2 дозы дупліцыраваных генаў, гомазіготныя — 4. Адбываецца пры разрыве і абмене ўчасткамі храмасом, а таксама ў выпадку няроўнага *кросінговера*; можа быць унутрыхрамасомная і міжхрамасомная. Адыгрывае важную ролю пры ўтварэнні новых генаў.

ДУПЛО́, поласць у ствале, каранях або буйных галінах дрэў, якая ўтварылася ў выніку разбурэння драўніны. Звычайна Д. ўзнікаюць у старых (перастойных) дрэвастоях на месцы мех. пашкоджання і распаду тканак драўніны пад уздзеяннем сапрафітных грыбоў і бактэрый, часам пры ўдзеле мурашак і птушак (напр., дзятлаў). Д. з'яўляецца сховішчам і месцам размнажэння многіх жывёл. У парках і садах дуплаватыя дрэвы патрабуюць своечасовага лячэння.

ДУПЛЯ́НКА ШЭ́РАЯ, грыб, тое, што *шаруха*.

ДУ́РАВА Надзея Андрэеўна (1783, Кіеў — 2.4.1866), першая ў Расіі жанчына-афіцэр, пісьменніца. У 1806, выдаўшы сябе за мужчыну, уступіла ў кав. полк, удзельнічала ў вайне з Францыяй у 1807, у вайне 1812 (кантужана ў Барадзінскай бітве), замежных паходах рус. арміі 1813—14. Была ардынарцам у М.І.Кутузава. Аўтар успамінаў («Запіскі Н.А.Дуравай», 1836—39), рамана «Гудзішкі» (1839), «Аповесцей і апавяданняў» (1839). Д. прысвечаны шэраг твораў л-ры і мастацтва — маст. фільм «Гусарская балада» (1962) паводле п'есы А.К.Гладкова «Даўным-даўно» (1942), опера А.В.Багатырова «Надзея Дурава» (1957) і інш.

Тв.: Избранное. М., 1984; Избранные сочинения кавалерист-девицы Н.А.Дуровой. М., 1988.

ДУРА́ВІЧЫ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Ліпа. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 12 км на У ад горада і чыг. ст. Буда-Кашалёва, 40

км ад Гомеля. 710 ж., 287 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ДУ́РАВЫ, сям'я рускіх цыркавых артыстаў — клоунаў і дрэсіроўшчыкаў.

Анатоль Леанідавіч (6.12.1865, Масква — 21.1.1916). Артыстычную дзейнасць пачаў як клоун, з 1880 гастраліраваў па Расіі, Еўропе, у 1915 выступаў у Мінску. Стварыў сатырычна-публіцыстычную клаунаду з дрэсіраванымі жывёламі.

Уладзімір Леанідавіч (6.7.1863, Масква — 3.8.1934), засл. арт. Рэспублікі (1927). Брат А.Л.Дурава. На арэне з 1885. Выступаў як клоун-сатырык і дрэсіроўшчык. Распрацаваў навук. метад дрэсіроўкі, заснаваны на гуманных адносінах да жывёл. У 1912 стварыў у Маскве звярынец (цяпер Куток імя У.Дурава).

Уладзімір Рыгоравіч (16.4.1909, г. Варонеж — 14.3.1972), нар. арт. СССР (1967). Унук А.Л.Дурава. У выступленнях спалучаў сатыр. клаунаду з паказам дрэсіраваных жывёл.

Юрый Уладзіміравіч (12.1.1910, Масква — 22.2.1971), нар. арт. СССР (1971). Унук У.Л.Дурава. У цырку з 1937. Выступаў з вялікай групай розных жывёл, спалучаў дрэсіроўку з сатыр. нумарамі.

Наталля Юр'еўна (н. 13.4.1934, Масква), нар. арт. СССР (1989). Дачка Ю.У.Дурава. Скончыла Літ. ін-т імя Горкага (1956). У 1956—59 дрэсіроўшчык Кутка У.Дурава, у 1963—73 — «Саюздзяржцырка». З 1978 маст. кіраўнік Тэатра звяроў імя У.Дурава. Аўтар аповесцей і апавяданняў на тэмы цырка. Дзярж. прэмія СССР 1987.

У цырку працуюць і інш. прадстаўнікі сям'і Д.

ДУРАЛЮМІ́Н (ад ням. Düren — горад, дзе была распачата прамысл. вытв-сць сплаву, + *алюміній*), дзюраль, дзюралюміній, назва групы сплаваў на аснове алюмінію. Маюдабаўкі (па масе) медзі (2,2—5,2%), магнію (0,2—2,7%), марганцу (0,2—1%). Найб. трывалы і найменш каразійнаўстойлівы сярод алюмініевых сплаваў, таму Д. часта плакіруюць чыстым алюмініем. Выкарыстоўваюць як канстр. матэрыял у авіяц. і трансп. машынабудаванні.

ДУРА́Н Пятрос (1.6.1852, г. Стамбул, Турцыя — 2.2.1872), армянскі пісьменнік. Жыў у Турцыі. Аўтар гіст. трагедый «Чорныя землі» (1868), «Арташэс Міратворац» (1869), «Звяржэнне дынастыі Аршакідаў» (1870), «Захоп Ані, сталіцы Арменіі» (1871) і інш., сац. драмы з тагачаснага жыцця «Тэатр, або Адвержаныя» (1871), лірычных вершаў, цесна звязаных з нац.-вызв. барацьбой арм. народа, прасякнутых нац.-патрыят., грамадз. і філас. матывамі.

ДУРАНІ́ЙСКАЯ ДЗЯРЖА́ВА, афганская дзяржава ў 1747—1818. Створана ў выніку ваен. паходаў *Ахмад-шаха Дурані* (1747—73), які да 1761 аб'яднаў афг. (пуштунскія) землі (тэр. ядро дзяржавы — Кандагар, Газні, Кабул, Пешавар, Герат), заваяваў Паўн.-Зах. Індыю (у т.л. Кашмір), Усх. Іран, Паўд. Туркестан. Сталіца — г. Кандагар, з 1773 Кабул (перанесена пры сыне і пераемніку Ахмад-шаха Цімур-шаху, які правіў у 1773—93). Эканам. аснову дзяржавы складала феад.-дзярж. ўласнасць на зямлю (зямельныя падаткі з падуладных тэрыторый). Найб. прывілеяванае становішча ў ёй мела афг. племя абдалі (дурані; да яго належаў і вярх. правіцель — шах), якое было вызвалена ад падаткаў. Распалася ў выніку сепаратызму ханаў афг. плямён і нац.-вызв. паўстанняў падуладных неафг. народаў.

Літ.: История Афганистана. М., 1982. С. 125—139.

ДУ́РАЎ Леў Канстанцінавіч (н. 23.12.1931, Масква), рускі акцёр, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1990). Скончыў школу-студыю МХАТ (1954), Вышэйшыя рэжысёрскія курсы (1985). Да 1963 у Цэнтральным дзіцячым т-ры, з 1963 у т-ры Ленінскага камсамола, з 1967 у т-ры на Малой Броннай (усе ў Маскве). Яркі характарны акцёр, валодае камед. і драм. дараваннем. Яго мастацтву ўласцівы непасрэднасць, адкрыты тэмперамент. Сярод лепшых роляў: штабс-капітан Снегіроў («Брат Алёша» В.Розава паводле Ф.Дастаеўскага), Станарэль («Дон Жуан» Мальера), Яга («Атэла» У.Шэкспіра). З 1954 здымаецца ў кіна- і тэлефільмах: «Двое ў стэпе», «34-ы хуткі», «Развітанне», «Семнаццаць імгненняў вясны», «Уся каралеўская рацьі» і інш.

ДУ́РАЧ Тэадор Часлававіч (9.2.1883, г. п. Чупахаўка Сумскай вобл., Украіна — 12.5.1943), дзеяч рабочага руху, юрыст. Скончыў Харкаўскі ун-т. Працаваў у судах на Украіне. З 1919 адвакат у Польшчы, абараняў дзеячаў рэв. і нац.-вызв. руху на судовых працэсах, у т.л. на працэсе Т.Домбаля (1922), працэсе 56-і (1928), кобрынскім (1933), луцкім (1934) і інш. Адзін з заснавальнікаў Міжнар. арг-цыі дапамогі рэвалюцыянерам у Польшчы. У 1933—37 нам. старшыні Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна. Адзін з заснавальнікаў Польскай рабочай партыі і чл. яе ЦК з 1942. У 1943 арыштаваны гестапа і ў час следства закатаваны. *У.М.Міхнюк.*

ДУ́РБАН (Durban), горад на У Паўднёва-Афр. Рэспублікі. Засн. ў 1822. 715,7 тыс. ж., з прыгарадамі 1137 тыс. ж. (1993). Вузел чыгунак і аўтадарог. Адзін з найбуйнейшых партоў Індыйскага ак. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: нафтаперапр., хім., маш.-буд., гарбарна-абутковая, тэкст., цукр., кансервавая. Суднабудаванне і суднарамонт. Прыморскі кліматычны курорт. Цэнтр турызму. 2 ун-ты. Музей і маст. галерэя.

ДУ́РБІН (Durbin) Дзіна [сапр. Мае (Мае) Эдна; н. 4.12.1921, Нью-Йорк], амерыканская кінаактрыса. У кіно з 1936. Папулярная ў канцы 1930 — пач. 1940-х г. у ролях абаяльных гераінь у муз. камедыях: «Сто мужчын і адна дзяўчына», «Першае каханне» (у пракаце «Першы баль»), «Гэта пачалося з Евы» (у пракаце «Шлюб паняволі»), «Сястра яго дварэцкага» і інш. Не здолеўшы пераадолець інерцыю аднатыпных персанажаў, актрыса губляла сваіх гледачоў. Пасля 1949 у кіно не здымалася.

ДУРГАПУ́Р, горад на У Індыі, на р. Дамодар, у штаце Зах. Бенгалія. Каля 500 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Буйны цэнтр цяжкай прам-сці ў горнапрамысл. раёне р. Дамодар. Металургічны камбінат; прадпрыемствы цяжкага машынабудавання, з-ды горнашахтавага абсталявання, аптычнага шкла і хімічныя.

ДУРГ-БХІЛАІНА́ГАР, горад у Індыі, у штаце Мадх'я-Прадэш. Утвораны ў 1980-я г. аб'яднаннем гарадоў Дург і Бхілаі. Каля 550 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Металургічны камбінат (на базе мясц. жал. і марганцавых руд, каменнага вугалю з навакольля г. Корба). З-д мінер. угнаенняў.

ДУ́РКА (Durkó) Жольт (н. 10.4.1934, г. Сегед, Венгрыя), венгерскі кампазітар. Засл. арт. Венгрыі. Скончыў Вышэйшую муз. школу імя Ф.Ліста ў Будапешце (1960, клас Ф.*Фаркаша*). Удасканальваўся ў акадэміі *«Санта-Чэчылія»* (1961—63). У муз. мове спалучаюцца элементы *вербункаша*, інтанацыі нар. плачаў з санорыкай, алеаторыкай і інш. Сярод твораў: опера «Майсей» (1977); араторыя «Надмагільнае слова» (1972); 2 кантаты; для аркестра «Эпізоды на тэму ВАСН» (1963), «Арнаменты»; «Венгерская рапсодыя» для 2 кларнетаў і аркестра (1964); Канцэрт для фп. з аркестрам (1981); «Альтаміра» для камернага хору і арк.; 2 стр. квартэты; п'есы для інструментаў сола з арк. ці камерным ансамблем. 1-я прэмія на Міжнар. трыбуне кампазітараў ЮНЕСКА (Парыж, 1975). Прэміі Венгрыі імя Ф.Эркеля (1968), імя Б.Бартака і Д.Пастары (1985).

М.М.**Дурнаво**.

ДУРНАВО́ Мікалай Мікалаевіч (4.11.1876, Масква — 27.10.1937?), рускі мовазнавец. Чл.-кар. АН СССР (1924), акад. АН БССР (1928). Скончыў Маскоўскі ун-т. З 1918 праф. Саратаўскага,

Бел. і Маскоўскага ун-таў. У 1933 рэпрэсіраваны, у 1934 высланы. Рэабілітаваны ў 1964. Даследаваў слав. мовазнаўства («Да пытання аб старажытнейшых перакладах на стараславянскую мову біблейскіх тэкстаў. Супрасльскі рукапіс», 1926, «Думкі і меркаванні аб паходжанні стараславянскай мовы і славянскіх алфавітаў» і «Да пытання аб распадзе агульнаславянскай мовы», 1929), дыялекталогію і гісторыю рус. мовы. Аўтар першага рус. слоўніка лінгвістычных тэрмінаў «Граматычны слоўнік» (1924). У навук. працах выкарыстоўваў факты бел. мовы, апублікаваў арт. «Увагі да беларускай фанетыкі» (1929), рэцэнзіі на бел. і ўкр. мовазнаўчыя выданні.

Літ.: Булахов М.Г. Восточнославянские языковеды. Т. 2. Мн., 1977.

І.К.Германовіч.

ДУРНАП'ЯН (Datura), род кветкавых раслін сям. паслёнавых. Каля 20 відаў. Пашыраны пераважна ў субтрапічнай і трапічнай зонах, асабліва ў Цэнтр. Амерыцы, некаторыя — ва ўмераным поясе. На Беларусі 2 віды: Д. смярдзючы (D. stramonium), трапляецца каля жылля, на засмечаных месцах, агародах пераважна ў паўн. раёнах, і фіялетавы (D. tatula), трапляецца як заносны від зрэдку на чыг. насыпах і сметніках.

Пераважна аднагадовыя травяністыя расліны з тоўстым, уверсе разгалінаваным прамастойным сцяблом і стрыжнёвым коранем, з непрыемным дурманлівым пахам (адсюль назва). Лісце простае, чаргаванае, зубчастае або лопасцевае, зялёнае ці з цёмна-фіялетавымі жылкамі, на чаранках. Кветкі буйныя, 5-членныя, двухполыя, белыя, сінявата- ці пурпурова-фіялетавыя, размешчаны па адной у развілках сцябла; вяночак з доўгай вузкай трубкай і шырокім складкаватым адгінам. Плод — яйцападобная 4-гнездавая каробачка з шыпамі. Лек. і дэкар. расліны. Ядавітыя.

ДУРНІЦЫ, тое, што *буякі*.

ДУРНІЧНІК (Xanthium), род кветкавых раслін сям. астравых. Каля 30 відаў. Пашыраны пераважна ў Паўн. і Цэнтр. Амерыцы. На Беларусі трапляюцца 4 віды: Д. валлякападобны, або звычайны (X. strumarium), каліфарнійскі (X. californicum), ігольчасты (X. spinosum) і эльбскі (X. albinum). Растуць па берагах рэк і вадаёмаў, каля дарог, жылля і інш.

Аднагадовыя травяністыя расліны з тоўстым прамастойным разгалінаваным сцяблом і стрыжнёвым коранем. Лісце чаргаванае, простае, зубчастае або лопасцевае, на чаранках. Кветкі дробныя, непрыкметныя, трубчастыя, аднаполыя, сабраны ў кошыкі: тычынкавыя шматкветныя, шарападобныя, размешчаны ў верхняй ч. агульнага суквецця, песцікавыя 1—2-кветныя, адзіночныя ці ў клубочках, з двухрадковай абгорткай, якая каля пладоў укрыта калючкамі або шыпамі. Плод — учэпістая авальная сямянка. Лек. (у лісці і сцёблах шмат ёду), алейныя, меданосныя і фарбавальныя расліны. Некат. віды ядавітыя.

Г.У.Вынаеў.

Дурнап'ян смярдзючы.

Дурнічнік ігольчасты.

ДУРЧЫ́Н Пётр Сідаравіч (25.10.1918, г. Мазыр Гомельскай вобл. — 19.7.1997), бел. мастак. Засл. дз. мастацтваў Беларусі (1990). Вучыўся ў Віцебскім маст. тэхнікуме (1934—37). Скончыў Маскоўскае маст. вучылішча памяці 1905 г. (1949). Працаваў у станковай графіцы ў тэхніцы пастэлі, літаграфіі, афорта і інш. Асн. творы прысвечаны абароне Брэсцкай крэпасці: «Брэсцкая крэпасць» (1957), «Цытадэль над Бугам» (1967), «Руіны чырвонаармейскага клуба» (1972), «Свяшчэнныя камяні», «Зорка бессмяротнасці» (абодва 1974), трыпціхі «Салдаты Брэста» (1979—81), «Памяць Брэста» (1992). Аўтар дыярамы «Абарона Брэсцкай крэпасці» ў Брэсцкім абл. краязнаўчым музеі (1957, з Ф. Зільбертам), шэрагу партрэтаў абаронцаў крэпасці П.М.Гаўрылава, Р.К.Семенюка, А.А.Вінаградава, Я.М.Фаміна, І.М.Зубачова, А.М.Кіжаватава і інш. з

П.Дурчын. Трыпціх «Памяць Брэста». 1992.

мемарыяльнай серыі «Жыццё за Радзіму» (1960—84). Творам уласціва дакумент. дакладнасць, лаканізм, манументальнасць кампазіцыі, вастрыня маст.-вобразных вырашэнняў. Сярод твораў на інш. тэмы: «Касцёл святой Ганны» (1972), «Над Прыпяццю» (1975), «Май» (1992—93), серыя «Мінск» (1959) і інш.

Літ.: Пугачева Э.Н. Петр Дурчин. Мн., 1986. *Г.А.Фатыхава.*

ДУРЫ́НА, хвароба непарнакапытных, тое, што *злучная хвароба*.

ДУ́РЫС (Duris), старажытнагрэчаскі мастак 1-й трэці 5 ст. да н.э.; прадстаўнік «строгага стылю». Працаваў у Атыцы, размалёўваў вазы. Захавалася

Дурыс. Сілены весяляцца. Каля 480 г. да н.э.

каля 280 ваз (39 з іх падпісаныя) з яго жанравымі і міфалагічнымі размалёўкамі (вытанчаныя па малюнку, з падоўжанымі прапорцыямі фігур), у т.л. амфара «Атлет і Ніке», кілікі «Эас з целам Мемнана», «Заняткі ў школе», «Сілены весяляцца» і інш.

Т. ван **Дусбург**. Арыфметычная кампазіцыя. 1930.

ДУ́РЭС (Durrës), горад на З Албаніі, на ўзбярэжжы Адрыятычнага м. Адм. ц. рэці (адм. адзінка) Дурэс. Засн. ў 627 да н.э. грэч. каланістамі пад назвай Эпідамн, рым. назва Дырахій. 85,4 тыс. ж. (1993). Вузел чыгунак і аўтадарог. Гал. порт краіны; паромная сувязь з Трыестам і Брындызі (Італія). База марскога рыбалоўства. Прам-сць: металаапр., суднабуд., харчасмакавая (у т.л. тытунёвая), гарбарная, гумавая. Прыморскі кліматычны курорт. Турызм. Гар. ўмацаванні 14 ст., мячэці.

ДУ́СБУРГ (Doesburg) Тэа ван [сапр. Кюпер (Küpper) Крысціян Эміль Мары; 30.8.1883, г. Утрэхт, Нідэрланды — 7.3.1931], галандскі архітэктар, жывапісец, тэарэтык мастацтва. Адзін з заснавальнікаў час. «Дэ Сціл» («De Stÿl») у Лейдэне, дзе прапанаваў дактрыну рацыянальнага мастацтва, што мае цягу да раўнавагі і гармоніі і вынікае з прамавугольных геам. форм. У 1908—16 працаваў у плыні *абстракцыянізму*: «Кампазіцыя», «Контракампазіцыя» і інш. Творы носяць геам. характар выбару элементаў прамавугольных і дыяганальных рытмаў («Арыфметычная кампазіцыя». 1930. і інш.). З 1922 пад уплывам *дадаізму*. Аўтар тэорыі «элементарызму» — дыяганальных рухаў, якія перадаюць інтэнсіўнасць жыцця.

Я.Ф.Шунейка.

ДУ́СТЫ (ад англ. dust пыл), парашкі (памер часцінак 3—30 мкм) з сумесі *пестыцыдаў* і інертных напаўняльнікаў (напр., тальку, крухмалу). Выкарыстоўваюць у сельскай гаспадарцы для барацьбы са шкоднымі насякомымі, пустазеллем, хваробамі раслін.

ДУ́ТАЎ Аляксандр Ільіч (17.8.1879, станіца Арэнбургская Арэнбургскай вобл., Расія — 7.3.1921), адзін з кіраўнікоў белага руху (гл. *Белая гвардыя*) у грамадз. вайну 1918—20 у Расіі. Ген.-лейтэнант (1919). Скончыў Акадэмію Генштаба (1908). Удзельнік 1-й сусв. вайны. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 выбраны старшынёй савета Саюза казацкіх войск, у чэрв. 1917 узначальваў Усерас. казацкі з'езд, падтрымліваў сувязь з ген. Л.Г.*Карнілавым*; з вер. 1917 атаман Арэнбургскага казацтва. У ліст. 1917 узняў антысав. мяцеж у Арэнбургу (ліквідаваны Чырв. Арміяй у 1918). У чэрв. 1918 у ходзе антысав. мяцяжу Чэхаславацкага корпуса арганізаваў белы рух на Урале. У ліст. 1918 — канцы 1919 камандаваў асобнай Арэнбургскай арміяй у складзе войск А.В.*Калчака*. У 1920 эмігрыраваў у Кітай, дзе забіты.

ДУ́ТАЎ Аляксандр Рыгоравіч (н. 6.4.1936, Ташкент), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1991). Скончыў Сярэднеазіяцкі дзярж. ун-т (1959). З 1971 у Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нац. АН Беларусі. Навук. працы па нейтронна-актывацыйным аналізе, радыяцыйна-стымуляваных працэсах у паўправадніках. Распрацаваў метады гетэрыравання дамешкавых элементаў у паўправадніковых структурах, спосабы павелічэння радыяцыйнай устойлівасці мікрасхем і інш.

Тв.: Активационный анализ в науке и технике. Мн., 1984 (разам з Г.В.Леушкінай, В.А.Комарам).

ДУ́ЎРСКІ ПРАЛІ́Ў (англ. Strait of Dover), гл. *Па-дэ-Кале*.

ДУ ФУ (712, каля г. Сіянь, Кітай — 770), кітайскі паэт. Шмат вандраваў па Кітаі з Гао Шы і *Лі Бо* (сяброўства з якім у многім вызначыла яго далейшы творчы лёс). З 746 жыў у сталіцы Чан'ані. У творчасці гэтага перыяду пераважалі тэмы нар. пакут, спагады беднякам, выкрыцця тых, хто прагнуў вайны: «Песня пра баявыя каляскіцы», «З сталіцы ў Фэнсянь». У час антыўрадавага мяцяжу ў 756 пакінуў сталіцу, жыў на чужыне. У творах таго часу пачуццё болі за свой народ і краіну («Вёска Цянцунь», цыклы вершаў «Тры чыноўнікі» і «Тры расстанні»). З 759 жыў у Чэнду, напісаў каля 1000 вершаў, у цэнтры якіх — імкненне ахвяраваць сабой дзеля людзей. Стыль Д. адметны яснасцю, акварэльнай празрыстасцю.

Тв.: Рус. пер. — Стихотворения. М.; Л., 1962.

Літ.: Серебряков Е.А. Ду Фу. М., 1958. *Г.В.Сініла.*

ДУХ, філасофскае паняцце, што азначае нематэрыяльны пачатак у адрозненне ад матэрыяльнага, прыроднага. Азначае таксама мысленне, псіхічныя здольнасці, пачатак, які вызначае паводзіны, унутр. маральную сілу асобы (гл. *Духоўнасць*). У гісторыі філасофіі Д. трактаваўся як паняцце (панлагізм), субстанцыя (*пантэізм*), асоба (*тэізм, персаналізм*). У рацыяналізме вызначальным бокам Д. лічыцца мысленне, свядомасць, у ірацыяналізме — пазаразумовыя аспекты (воля, пачуццё, уяўленне, інтуіцыя і г.д.). Дыялект. матэрыялізм звязвае духоўнае з працэсам і вынікамі чалавечай дзейнасці, з духоўнай вытворчасцю. У стараж.-грэч. філасофіі Д. — пнеўма, *нус*, *логас*; у рэліг.-містычных уяўленнях — бесцялесная, звышнатуральная істота (гл. таксама *Тройца*). *В.В.Краснова.*

ДУХАБО́РЫ, духаборцы, сектанцкая плынь, адзін з кірункаў духоўных хрысціян. Узнікла ў Расіі ў 2-й пал. 18 ст. Назва паходзіць ад «барацьбіты за дух і ісціну». Асновы вучэння Д. выкладзены ў псалмах «Жывотнай кнігі», дзе трактуецца галоўнае для іх паняцце: Бог — усюдысны дух. Д. не прызнавалі таінстваў, абрады (акрамя шлюбу), святароў, манастваў, адмаўлялі свецкую і духоўную ўладу, выступалі супраць дзяржавы і Рус. правасл. царквы. За непадпарадкаванне ўладам і адмаўленне ад воінскай службы праследаваліся царскім урадам, неаднаразова зведвалі *дэпартацыі*. У канцы 19 ст. частка Д. перасялілася ў Канаду. Невял. групамі жывуць на Паўн. Каўказе, у Азербайджане, у Растоўскай, Тамбоўскай, Арэнбургскай абл. Расіі, на Д. Усходзе, Украіне і ў Сярэдняй Азіі.

ДУХАВА́Я МУ́ЗЫКА, разнавіднасць інструментальнай музыкі, прызначаная для выканання на духавых інструмен-

тах. Ахоплівае творы для асобных інструментаў, для ансамбляў і аркестраў. Вядома са старажытнасці. Яе вытокі звязаны з магічна-рытуальнымі абрадамі, ваен., паляўнічымі, пастухоўскімі і інш. сігналамі (гл. *Сігнальная музыка*). На працягу стагоддзяў складваліся маст. выразныя сродкі, жанры, формы Д.м. Яе асн. жанры: камерна-інструментальны (санаты, фантазіі, мініяцюры, трыо, квартэты і інш.), *марш*, *папуры*. У рэпертуары *духавых аркестраў* таксама розныя п'есы, уверцюры, часам сімфоніі (М.Мяскоўскі, І.Стравінскі), інструментоўкі сімф., балетнай, вак., народнай, а таксама аранжыроўкі і кампіляцыі эстраднай, танц. і джазавай музыкі.

На Беларусі выкарыстанне труб, рагоў, дудак у вайск., паляўнічым, прыдворным побыце і старажоўстве адлюстравана ў летапісных і літ. крыніцах («Песня пра зубра» М.Гусоўскага, «Александрыя», «Пан Тадэвуш» А.Міцкевіча), муз. антуражы арх. помнікаў стылю ракако, нац. геральдыцы. З 13 ст. музыка на духавых інструментах суправаджала выступленні скамарохаў. Пастухоўскія сігналы, песенныя, танц. імправізацыі і найгрышы на духавых інструментах (фуярка, чаратоўка, жалейка, дудка, дуда, флейта, кларнет) здаўна ўводзілі ў рэпертуар народных інстр. ансамбляў і аркестраў. Пра характар быт. музыкі 16—17 ст. у выкананні духавых інструментаў дае ўяўленне т.зв. «*Полацкі сшытак*». У канцы 17 — пач. 18 ст. выканальніцтва на духавых інструментах актыўна развівалася на Магілёўшчыне. У жанрах Д.м. працавалі І.*Дабравольскі*, Вус, Нямцэвіч і інш. У 2-й пал. 18 — пач. 20 ст. Д.м. Беларусі ўключала пераважна п'есы прыкладнога характару (маршы, бальныя танцы і інш.) і камерна-інстр. творы. У 1930—50-я г. асновы арыгінальнага бел. рэпертуару для духавога аркестра залажылі М.Аладаў, Ю.Бяльзацкі, Дз.Лукас, П.Падкавыраў, С.Палонскі, М.Чуркін, Я.Цікоцкі. У 1960—90-я г. ў розных жанрах Д.м. працавалі Л.Абеліёвіч, У.Алоўнікаў, А.Багатыроў, У.Буднік, Г.Вагнер, В.Войцік, Г.Гарэлава, Я.Глебаў, А.Гураў, У.Дамарацкі, Я.Дзягцярык, Э.Зарыцкі, Л.Захлеўны, Э.Казачкоў, С.Картэс, А.Клеванец, І.Кузняцоў, І.Лучанок, А.Мдывані, У.Палуэктаў, У.Прохараў, Ю.Семяняка, Дз.Смольскі, Р.Сурус, В.Сярых, К.Цесакоў, Л.Шлег і інш.

Літ.: Левин С.Я. Духовые инструменты в истории музыкальной культуры. Ч. 1—2. Л., 1973—83.

А.Л.Карацееў.

ДУХАВЕ́НСТВА, асобная іерархічная карпарацыя прафес. служак культу ў розных рэлігіях, якая выконвае ролю пасрэдніка паміж Богам і вернікамі, ажыццяўляе арганізац., магічна-культавыя дзеянні і прапаведуе веравучэнне пэўнай рэлігіі. Д. сфарміраваліся ў стараж. часы на аснове *жрэцтва* і па сутнасці з'яўляецца прадаўжальнікам яго традыцый. У залежнасці ад свайго становішча і функцыі ў царкве Д. падзяляецца на вышэйшае і ніжэйшае. У некат. рэлігіях прадстаўнікоў вышэйшага Д. шануюць як намеснікаў Бога на зямлі (*папа рымскі* ў каталіцызме) або як увасабленне бажаства (*далай-лама* ў ламаізме, кіраўнік секты ісмаілітаў). У шэрагу рэлігій Д. падзяляецца на белае (абслугоўвае прыход, храмы; складаецца з асоб жанатых, што знаходзяцца ў адным шлюбе, неразведзеных) і чорнае (спалучае манаства са свяшчэнніцкім санам, дае зарок бясшлюбнасці, поўнага паслушэнства і г.д.). У першых хрысц. абшчынах Д. не існавала. У 2 ст. склаўся ін-т *епіскапаў* (кіраўнікоў хрысц. абшчын), у 4 ст. пашырылася *манаства*, потым на аснове *епіскапата* ўзнікла *папства*. Канчаткова ў хрысціянстве Д. сфарміраваліся ў 5 ст., пасля таго, як яно стала дзярж. рэлігіяй Рымскай імперыі. У Стараж. Русі, у т.л. і Беларусі, куды хрысціянства прыйшло ў канцы 10—11 ст. з Візантыі, паступова фарміраваліся кадры свяшчэннаслужыцеляў, усталёўвалася выразная царк.-адм. структура, якая складалася з *епархій* на чале з епіскапамі. Узначальваў іерархію Д. кіеўскі *мітрапаліт*, што падпарадкоўваўся канстанцінопальскаму *патрыярху*. У 1448 на чале Рус. правасл. царквы быў пастаўлены мітрапаліт Маскоўскі і ўсяе Русі. У 1589 вышэйшы правасл. іерарх быў пасвячоны ў сан патрыярха. У 14—16 ст. амаль усю тэр. Беларусі ахоплівала Віленскае біскупства (дыяцэз), якое налічвала 259 парафій каталіцкай царквы. Д. тут было прадстаўлена арцыбіскупамі, біскупамі, суфраганамі (памочнікамі біскупаў), плябанамі, *вікарыямі* і інш. Падобная структура Д. была характэрна і для *Беларускай грэка-каталіцкай царквы*, якая ўсталявалася ў выніку *Брэсцкай уніі 1596*. У 1790 у 14 бел. паветах ВКЛ было 143 правасл., 1199 уніяцкіх, 83 рымска-каталіцкія і 16 кальвінісцкіх прыходаў. У канцы 19 — пач. 20 ст. на Беларусі служылі 104 протаіерэі, 1924 святары, 234 *протадыяканы*, *дыяканы* і паддыяканы, 1911 псаломшчыкаў, прычэтнікаў, пеўчых і званароў. З 2-й пал. 16 ст. на Беларусі разгарнула дзейнасць і стварыла свае абшчыны пратэстанцкае Д. — кальвіністы, лютэране, антытрынітарыі. Мячэці мусульм. абшчын, якія таксама дзейнічалі на Беларусі, абслугоўваліся *муламі* (*імамамі*) і муэдзінамі (памочнікамі).

Рэліг. жыццё і дзейнасць Д. на Беларусі сталі актыўна адраджацца ў 1990-я г. На пач. 1997 зарэгістравана 37 рэліг. канфесій (афіцыйна дзейнічаюць больш як 20), 2120 рэліг. абшчын. Правасл. епархіі ўзначальваюць 2 *архіепіскапы* і 8 епіскапаў, кіраўніком *Беларускай праваслаўнай царквы* з'яўляецца мітрапаліт Мінскі, Слуцкі, патрыяршы экзарх усяе Беларусі *Філарэт*. У благачынных акругах (аб'ядноўваюць 964 прыходы) служаць больш за 900 *свяшчэннікаў*. Вышэйшую іерархію каталіцкай царквы (аб'ядноўвае 362 прыходы) з 1994 узначальвае мітрапаліт мінскі і магілёўскі Казімір *Свёнтак*. Дэкан Бел. грэка-каталіцкай царквы (уваходзяць 11 абшчын) Ян *Матусевіч*. Розныя катэгорыі Д. абслугоўваюць 332 абшчыны Саюза хрысціян веры евангельскай, 37 — адвентыстаў сёмага дня, 14 — сведкаў Іеговы, 33 — стараверaў, 22 мусульм. абшчыны, 15 іудзейскіх абшчын і інш. Падрыхтоўкай Д. на Беларусі займаюцца *духоўныя навучальныя ўстановы*.

Т.І.Адула.

ДУХАВЫ́ АРКЕ́СТР, аркестр духавых інструментаў, калектыў выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Сярод спецыфічных асаблівасцей Д.а.: тэмбрава-каларыстычная яскравасць гучання, дынамічныя градацыі, шырыня дыяпазону, высокая тэсітура, магчымасць выкарыстання на адкрытым паветры, у руху, пры эфектных перабудовах, што абумоўлівае яго абавязковае ўключэнне ў ваен. побыт. Д.а. ўдзельнічаюць у маштабных сацыяльна-культ. мерапрыемствах, служаць важным сродкам муз.-эстэт. выхавання. Склад Д.а. гістрычна мяняўся. Сучасныя Д.а. адрозніваюць па відах (прафес., самадзейныя, у т.л. дзіцячыя, дарослыя, жаночыя, цывільныя, ваен., вучэбныя, канцэртныя і інш.) і па складзе: медны і мяшаны малы, няпоўны і вялікі (вял. медны ўключае групы характэрных, ударных і асн. амбушурных інструментаў; вял. мяшаны — увесь сучасны духавы і ўдарны інструментарый). Часам у Д.а. уключаюць эпізадычныя і нетрадыц. сольныя інструменты.

Д.а. вядомы са старажытнасці. У Грэцыі, Егіпце, Індыі, Кітаі, Персіі, Шумера-Вавілоніі яны служылі для суправаджэння розных урачыстасцей, рэліг. цырымоній і ваен. дзеянняў. З 17 ст. паявіліся ў Еўропе. Музыку для Д.а. пісалі Ф.Гасек, Г.Ф.Гендэль, Л.Бетховен, Г.Берліёз, Р.Вагнер, Э.Метюль, А.Аляб'еў, А.Арэнскі, М.Рымскі-Корсакаў і інш. Д.а. выкарыстоўваюць у складзе сімф. аркестра (Рэквіем Берліёза, Урачыстая уверцюра «1812 год» П.Чайкоўскага), часам уводзяць у оперу (напр., медны Д.а., ці т.зв. «банда», іграе ў «Сівой легендзе» Дз.Смольскага, «Матухне Кураж» С.Картэса).

На Беларусі (паводле летапісных і літ. крыніц) ансамблі духавых і ўдарных інструментаў здаўна выкарыстоўваліся ў вайск. і прыдворным побыце. У 16—18 ст. найб. пашыраны былі ваен. аркестры, сярод іх «*янычарская музыка*», і прыгонныя, у т.л. *рагавыя аркестры* («паляўнічая музыка»), «музыка шклоўскага корпуса» С.Зорыча і інш. У 19 — пач. 20 ст. існавалі шматлікія ваен. і цывільныя Д.а., у т.л. пад кіраўніцтвам І. і К.Вяржбіцкіх, Д. і В.Стафановічаў, А.Чартовіча ў Мінску, пры культавых установах, пажарных дружынах, аматарскія калектывы пры гімназіях і рэальных вучылішчах. У 1990-я г. на Беларусі працуюць *Ваенны аркестр Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь*, Аркестр Мін-ва ўнутр. спраў Рэспублікі Беларусь, мінскі аркестр духавых інструментаў «*Няміга*», гарадскія ў Гомелі, Гродне, вучэбныя ў Бел. акадэміі музыкі («Фанфары Беларусі»), Бел. ун-це культуры («Светач»), Магілёўскім муз. вучылішчы, Гродзенскім вучылішчы мастацтваў, а таксама шматлікія аматарскія Д.а., у т.л. жаночыя і дзіцячыя. Іх дзейнасць значна стымулюе творчасць бел. кампазітараў у галіне *духавой музыкі*.

Літ.: Инструменты духового оркестра. Мн., 1984; Организация духовых оркестров и

обучение игре на духовых инструментах. Мн., 1981. *А.Л.Карацееў.*

ДУ́ХАЎ Мікалай Леанідавіч (26.10.1904, в. Вепрык Палтаўскай вобл., Украіна — 1.5.1964), савецкі вучоны ў галіне механікі, канструктар цяжкіх танкаў. Чл.-кар. АН СССР (1953), ген.-лейт. інж.-тэхн. службы (1954). Тройчы Герой Сац. Працы (1945, 1949, 1954). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1932).

М.Л.Духаў.

З 1932 канструктар на Кіраўскім з-дзе ў Ленінградзе, з 1948 нам. навук. кіраўніка і гал. канструктара НДІ, з 1954 гал. канструктар і навук. кіраўнік КБ абароннай прам-сці. Ленінская прэмія 1960, Дзяж. прэміі СССР 1945, 1949, 1951, 1953, 1954.

ДУ́ХІ, у міфалагічных і рэлігійных уяўленнях бесцялесныя звышнатуральныя істоты, якія прымаюць удзел у жыцці прыроды і чалавека. Падзяляюцца на злых (нячыстых — чорт, нячысцік, д'ябал), якія шкодзяць чалавеку, і добрых, карысных для яго. Адрозніваліся Д. дрэў, крыніц, рэк, лясоў, нараджэння і смерці, хвароб і здароўя чалавека, Д. грамады, роду, Сонца, Месяца і інш.

ДУХІ́, парфумерны сродак; спіртавы ці спіртаводны раствор сумесей *пахучых рэчываў* — парфумерных кампазіцый і настояў. Маюць ад 10 да 50% кампазіцый, канцэнтраваныя — больш за 20%. У склад кампазіцыі звычайна ўваходзяць некалькі дзесяткаў розных пахучых рэчываў. Паводле характару паху падзяляюць на 2 групы: кветкавыя (імітуюць пах кветак) і фантазійныя (пах створаны фантазіяй парфумера). Д. сухія (сашэ) — пакецікі з паперы ці тканіны, напоўненыя цвёрдымі пахучымі рэчывамі (пялёсткі ружы, здробнены корань касача і інш.), якія кладуць у бялізу для надання ёй прыемнага паху. Гл. таксама *Парфумерыя*.

ДУХМЯ́НАЯ, сорт грушы селекцыі Бел. НДІ пладаводства. Выведзена скрыжаваннем сартоў Аляксандраўка і Любіміца Клапа. Знаходзіцца ў дзярж. сартавыпрабаванні.

Дрэва сярэднярослае, крона плоскакруглаватая, густая. Сорт сярэднезімаўстойлівы, ураджайны, мала пашкоджваецца хваробамі. Плоданашэнне пачынае на 4—5-ы год. Плады сярэдняй велічыні (110—130 г). Скурка жаўтавата-зялёная з размытым у выглядзе палос цагляна-чырвоным румянцам. Мякаць белая, мяккая, сакаўная, кісла-салодкая, добрага смаку. Спажывецкая спеласць у сярэдзіне жніўня. *М.Р.Мялік.*

ДУХМЯ́НЫ КАЛАСО́К, гл. ў арт. *Пахучакаласнік*.

ДУХО́НІН Мікалай Мікалаевіч (13.12.1876—3.12.1917), расійскі ваен. дзеяч. Ген.-лейтэнант (1917). З дваран Смаленскай губ. Скончыў Аляксандраўскае ваен. вучылішча (1896) і Акадэмію Генштаба (1902). У 1-ю сусв. вайну камандаваў палком, памочнік (са снеж. 1915) і ген.-кватэрмайстар (з чэрв. 1916) штаба Паўд.-Зах. фронту, нач. штаба Паўд.-Зах. (чэрв.—жн. 1917) і Зах. (жн.—вер. 1917) франтоў, нач. штаба пры вярх. галоўнакамандуючым А.Ф.Керанскім (з 23.9.1917). Выконваў абавязкі вярх. галоўнакамандуючага пасля Кастр. рэвалюцыі (16—22.11.1917; зняты з пасады сав. ўладамі за адмову неадкладна ўступіць у мірныя перагаворы з герм.-аўстр. камандаваннем). 3.12.1917 арыштаваны; забіты на вакзале ў Магілёве натоўпам салдат і матросаў, якія даведаліся пра вызваленне ім з турмы ў Быхаве кіраўнікоў *Карнілава мяцяжу 1917* (ген. Л.Г.Карнілава, А.І.Дзянікіна і інш.).

«ДУХО́ЎНАЕ ПРЫЧА́СЦЕ СВЯТЫ́Х БАРЫ́СА І ГЛЕ́БА», польска-бел. школьная драма эпохі барока. Аўтар невядомы. Уваходзіць у рукапісны зб. канца 17 ст. *«Аршанскі кодэкс»*. Паст. ў Полацку і, магчыма, у Оршы да 1693. У аснове сюжэта падзеі 11 ст. ў Полацку і Кіеве (феад. міжусобіцы, пашырэнне хрысціянства). Рэчаіснасць і вобразы гал. герояў святых Барыса і Глеба пададзены ўмоўна. Твор уключае антыпралог, пралог і 4 інтэрмедыі. У інтэрмедыях адлюстравана жыццё бел. грамадства канца 17 ст. Дзейныя асобы драмы селянін («хлоп»), гарбар, салдат, яўрэй, хлопцы-парабкі, якія гавораць па-беларуску, прадстаўлены людзьмі абмежаванымі. Мяркуючы па змесце, аўтар — каталік-езуіт, прыхільнік ідэалогіі пануючых класаў. Твор апубл. І.Ляванскім у «Старапольскай драматургіі» (Варшава, 1963. Т. 6).

Літ.: Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 175—192.



Груша **Духмяная**.

ДУХО́ЎНА-РЫ́ЦАРСКІЯ О́РДЭНЫ, ваенна-рэлігійныя аб'яднанні, арганізаваныя на ўзор каталіцкіх манаскіх ордэнаў. Узніклі ў час *крыжовых паходаў* як брацтвы для дапамогі паломнікам у Палесціне, з 12 ст. — ваен. арг-цыі для аховы і пашырэння хрысц. уладанняў на Усходзе, барацьбы з мусульманамі і язычнікамі. З канца 11 ст. да 1300 заснавана 12 Д.-р.о.: Ордэн коннікаў шпіталя св. Яна Іерусалімскага (шпітальеры, прыбл. з 1070); Ордэн бедных рыцараў Хрыста і Саламонава храма (*тампліеры*, з 1116 або 1119); *Авіскі ордэн* (з 1162 або 1166); Ордэн св. Міхаіла (з 1167); ордэн мечаносцаў (з 1202); Ордэн прускіх рыцараў Хрыстовых з Добжыні (з пач. 13 ст.) і інш. Іх члены давалі зарокі ўстрымання, паслушэнства, беднасці, падзяляліся на братоў-воінаў, капеланаў (святароў) і братоў-служыцеляў. Ордэн узначальваў вял. магістр (выбіраўся пажыццёва), якому падпарадкоўваліся камандзіры мясц. аддзелаў (правінцый і бальяжаў) — магістры (прыёры), прэцэптары, камандоры, канэтабль і інш. і пры якім перыядычна склікаўся ген. капітул (савет), які валодаў заканад. уладай. Д.-р.о. былі незалежныя ад мясц. свецкіх і духоўных улад і падпарадкоўваліся непасрэдна рым. папу, які даваў ім значныя прывілеі. Найб. магутнымі былі т.зв. «інтэрнацыянальныя» ордэны (шпітальеры, тампліеры, *Тэўтонскі ордэн*), якія мелі аддзелы ва ўсіх краінах Зах. Еўропы, уласныя арміі, вял. зямельныя ўладанні і грашовыя сродкі. Пасля страты ў 13 ст. ўладанняў на Усходзе Д.-р.о. перанеслі дзейнасць на Зах. Еўропу, дзе яны сталі адной з вядучых ваен. і паліт. сіл. З умацаваннем каралеўскай улады б.ч. ордэнаў перастала існаваць.

Літ.: Печников Б.А. «Рыцари церкви»: Кто они? М., 1991. *Дз.М.Чаркасаў.*

ДУХО́ЎНАСЦЬ, уласцівае асобе або сац. групе імкненне да пазнання Сусвету, месца і ролі ў ім чалавека, стаўленне да чалавечай асобы і яе творчасці як да вышэйшай мэты і каштоўнасці развіцця грамадства, падпарадкаванне матэрыяльных здабыткаў і інтарэсаў духоўным, маральна-эстэт. здабыткам і каштоўнасцям. Існуюць 3 формы Д.: Д. асобнага індывіда (асобы); Д. сац. групы (напр., інтэлігенцыі) ці грамадства ў цэлым; Д. Бога, абсалютнай ідэі (у Платона, Г.Гегеля). Д. асобы ствараецца ў працэсе духоўнай працы; таму духоўныя адрозненні паміж людзьмі значна большыя, чым біялагічныя. Індывід. Д. становіцца сама сабой і няўхільна развіваецца пры актыўным уключэнні асобы ў духоўную сферу, культуру сац. групы і грамадства, якую яна можа засвоіць і тым самым узбагаціць сваю духоўную сутнасць у працэсе *сацыялізацыі*, адукацыі і выхавання. Носьбіт індывід. Д. — сац.-псіхалагічны свет пэўнай асобы, грамадскай Д. — сац. супольнасць (група, этнас, нацыя, народ). Д. грамадства трэба разглядаць як інтэграваную цэласнасць у непарыўным адзінстве з мноствам разнастайных індывід. Д. Напр., гра-

мадская Д. бел. народа — сукупнасць духоўных прэдыкатаў, уласцівых гэтаму народу, адзінаму творцу сваёй гісторыі і культуры. *Я.М.Бабосаў.*

ДУХО́ЎНЫЯ ВЕ́РШЫ, эпічныя і лірычныя песні на сюжэты старазапаветных, евангельскіх казанняў і міфаў, жыцій святых, рэліг. легенд, апокрыфаў. Выконвалі вандроўныя жабракі, лірнікі. Паэт. формай адны блізкія да былін, другія — да абрадавых песень, трэція — да малітваў. Былі пашыраны ва ўсіх слав. народаў. Першы запіс рус. Д.в. вядомы з 15 ст. У 1848 упершыню некалькі бел. Д.в. разам з рус. апублікаваў П.В.Кірэеўскі. Шмат іх сабралі П.А.Бяссонаў, П.В.Шэйн, Е.Р.Раманаў, М.Я.Нікіфароўскі, М.Федароўскі. Эпічныя Д.в. апавядалі пра стварэнне свету, страшны суд, Адама і Еву, Ісуса Хрыста, Лазара, Барыса і Глеба і інш. Лірычныя былі блізкія да малітваў, царк. песень, кантаў. Асабліва папулярай была песня пра беднага Лазара і багатыра.

Літ.: Карский Е.Ф. Белорусы. М., 1916. Т. 3, ч. 1. С. 496—531; Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць. Мн., 1967. С. 97—104. *А.С.Фядосік.*

ДУХО́ЎНЫЯ НАВУЧА́ЛЬНЫЯ ЎСТАНО́ВЫ, рыхтуюць служыцеляў культу і даюць тэалагічную адукацыю. Першыя Д.н.ў. ўзніклі пры храмах Стараж. Егіпта і Стараж. Вавілона (2-е тыс. да н.э.) для падрыхтоўкі жрацоў (гл. *Жрэцтва*). Сучасныя Д.н.ў. падзяляюцца на вышэйшыя — тэалагічныя ун-ты і ін-ты, адпаведныя ф-ты пры свецкіх ун-тах, акадэміі; сярэднія — семінарыі, каледжы і ліцэі (хрысц.), медрэсэ (мусульм., бываюць таксама вышэйшымі), вышэйшыя тэалагічныя і каранічныя школы, *ешыбот* (іудаісцкія); ніжэйшыя — біблейскія, катэхізічныя, каранічныя, манастырскія і інш. школы. Найб. колькасць розных Д.н.ў. маюць сусветныя рэлігіі — будызм, іслам, хрысціянства.

На Беларусі першыя Д.н.ў. ўзніклі ў канцы 16 — пач. 17 ст. (гл. *Езуіцкія навучальныя ўстановы, Кальвінісцкія школы*). Былі закрытага ці паўзакрытага тыпу. Адукацыя мела пераважна гуманіт. характар. Праваслаўных святароў рыхтуюць *Мінская духоўная акадэмія, Мінская вышэйшая духоўная семінарыя* (в. Жыровічы Слонімскага р-на), каталіцкіх святароў — *Гродзенская вышэйшая духоўная семінарыя*. У Мінску працуюць Біблейскі ін-т і Біблейская школа Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Тэалагічны ін-т і Біблейскі каледж («Хрыстос для народаў») Саюза хрысціян веры евангельскай, Вышэйшы завочны іудзейскі рэлігійны ешыбот, Вышэйшы духоўны каледж «Эйш Хаторы» («Агонь Торы») іудзейскага рэліг. аб'яднання. Святароў рыхтуе таксама багаслоўскі ф-т *Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта.*

ДУ́ЧА ДЫ БУАНІНСЕ́НЬЯ (Duccio di Buoninsegna; каля 1255, г. Сіена, Італія — 3.8.1319), італьянскі жывапісец. Заснавальнік *сіенскай школы* жывапісу 14 ст. Зазнаў уплыў італа-візант. жывапісу і франц. гатычнай мініяцюры. Для яго твораў характэрны асобныя рысы мастацтва Протарэнесансу. Стварыў алтарныя абразы з арнаментнымі залатымі фонамі, гучнай вытанчанай каляровай гамай («Мадонна са святымі», «Мадонна з шасцю анёламі», «Мадонна францысканцаў», каля 1280, «Мадонна Ручэлаі», 1285). У гал. творы — алтарным абразе сіенскага сабора «Маэста» (двухбаковы паліптых, 1308—11) з выявай Мадонны ў акружэнні святых і анёлаў на пярэднім баку і сцэн «пакут» Хрыста на тыльным баку — імкнуўся надаць большую жыццёвасць і пераканаўчасць традыц. кампазіц. схемам, перадаць прастору і аб'ём. У 1288 па яго малюнку быў выкананы першы ў Італіі манумент. вітраж.

Дуча ды Буанінсенья. Мадонна Ручэлаі. 1285.

ДУ́ЧЫЦ Людміла Уладзіміраўна (н. 12.12.1950, Мінск), бел. археолаг. Канд. гіст. н. (1982). Скончыла БДУ (1975). З 1974 у Ін-це гісторыі АН Беларусі. Вывучае гісторыю ПнЗ Полацкага княства, культавыя камяні, каменныя крыжы, археал. мікратапаніміку, стараж. касцюм на тэр. Беларусі. Праводзіла раскопкі гарадзішчаў на Браслаўшчыне, курганоў на Пн Беларусі, гідраархеал. даследаванні ў Падзвінні.

Тв.: Край блакітных азёр. Мн., 1988; Браслаўскае Паазер'е ў IX—XIV стст.: Гіст.-археал. нарыс. Мн., 1991; Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў. Мн., 1993; Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. (паводле археалагічных звестак). Мн., 1995.

ДУ́ЧЫЦ Мікалай Васілевіч (20.9.1896, г.п. Любча Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. — 3.9.1980), бел. жывапісец і графік. Вучыўся ў пецярбургскай школе Т-ва заахвочвання мастацтваў (1914—15). Працаваў пераважна ў жанры пейзажа. Творам уласціва лірычнасць і стрыманая каляровая гама («Ускраіны Мінска», 1922, 1943; «Зіма», «Рэчка Волма», абодва 1946; «Пачатак вясны», 1951, «Зіма ў Зялёным», 1954, «Ля млына», 1955, «На беразе Свіслачы», 1965, «Лясная казка», 1969). Шэраг графічных работ прысвечаны Мінску («Стары Мінск», 1922; серыя «Віды Мінска», 1929, і інш.). Пісаў нацюрморты («Дары беларускага лесу», 1969—70).

ДУШ (франц. douche ад італьян. doccia вадасцёкавая труба), прылада для аблівання цела тонкімі вадзянымі струменямі. Таксама гігіенічная і лячэбная водная працэдура, якая заключаецца ва ўздзеянні на цела чалавека струменяў вады рознай т-ры і ціску.

Выкарыстоўваюць Д. халодны (т-ра ніжэй за 20 °С), субхалодныя (да 34 °С), індыферэнтныя (34—36 °С), цёплыя (38—39 °С), гарачыя (40 °С і вышэй), кантрастныя (з пераменнай т-рай 10—25 і 45 °С); з лек.-прафілакт. мэтамі выкарыстоўваюць звычайна дажджавы, ігольчасты, пылавы, цыркулярны, узыходны, Д. Шарко, шатландскі; ціск вады ад 0,3 да 4 атм.

М.Дучыц. Ля млына. 1955.

ДУША́, паняцце, якое адлюстроўвае гістарычна зменлівыя погляды на псіхіку чалавека і жывёл; у рэлігіі, ідэаліст. філасофіі і псіхалогіі — паняцце пра асаблівую нематэрыяльную субстанцыю, незалежную ад цела. Узыходзіць да стараж. уяўленняў пра асаблівую сілу, што знаходзіцца ў целе чалавека і жывёлы (часам раслін) і пакідае яго ў час сну або смерці (вучэнне пра перасяленне душ — метэмпсіхоз). Ідэі ўсеагульнай адушаўлёнасці космасу (*гілазаізм*, *панпсіхізм*) сталі асновай вучэння пра сусв. душу (Платон, неаплатанізм). У Арыстоцеля Д. — актыўны мэтазгодны пачатак («форма») жывога цела, неаддзельны ад яго. У тэістычных рэлігіях Д. чалавека — створаны Богам, непаўторны бессмяротны духоўны пачатак. У пантэістычным аверазме Д. — толькі індывід. праяўленне адзінай духоўнай субстанцыі (*монапсіхізм*). У дуалістычных вучэннях Д. разумеецца як нешта спрадвечнае і існуючае поруч з целам (Р.Дэкарт, Г.Спенсер, В.Вунт, У.Джэмс). У новаеўрап. л-ры тэрмін «Д.» выкарыстоўваецца пераважна для абазначэння ўнутр. свету чалавека.

В.В.Краснова.

ДУШАНБЕ́, горад, сталіца Таджыкістана. Размешчаны ў Гісарскай даліне, на р. Душанбінка (у верхнім цячэнні р. Варзоб), на выш. 750—930 м. 582,4 тыс. ж. (1991). Чыг. вузел. Прам-сць: машынабуд. і металаапр. (з-ды тэкст. машын, гідраагрэгатаў, кабелю, быт. халадзільнікаў, арматурны і інш.), лёгкая (баваўнянае, гарбарна-абутковае, швейнае аб'яднанні, шаўковы камбінат), харчасмакавая (маслабойны, тлушчавы, мясны, малочны камбінаты і інш.), буд. матэрыялаў (цэментны, домабуд. камбінаты, з-д жалезабетонных канструкцый і інш.). Турызм. АН Таджыкістана. 8 ВНУ (у т.л. ун-т). Т-ры: оперы і балета, тадж. драмы, рус. драматычны, маладзёжны і інш.; цырк, філармонія. Заапарк, бат. сад АН.

Пабудаваны на месцы кішлака Дзюшамбе, у якім да 1917 жылі некалькі соцень жыхароў. У 1922 кішлак разбураны басмачамі. З 1924 Д. — сталіца Таджыкскай АССР (з 1925 горад), з 1929 — Таджыкскай ССР, з 1991 — Таджыкістана.

Сучасны горад з прамавугольнай сеткай вуліц-алей, шырокімі азеленымі плошчамі і паркавай зонай са штучным возерам пабудаваны паводле ген. планаў 1937 і 1965. Галоўная арх.-планіровачная вось горада — праспект Рудакі з бульварам, асн. плошчамі, помнікамі Рудакі, А.Фірдаўсі і інш., будынкамі прэзідыума АН Таджыкістана (1934—36, арх. С.В.Куцін), бібліятэкі імя Фірдаўсі (1952—54, арх. С.Л.Анісімаў, скульп. А.А.Татарынава, маст. М.Алімаў), выліч. цэн-

Да арт. **Душанбе**. Панарама горада (злева), Нацыянальная бібліятэка імя А.Фірдаўсі (справа).

Да арт. **Душанбе**. Помнік А.Фірдаўсі.

Душанбе. Дом урада.

тра (1976, арх. В.М.Лях), Палаца саюза тэатр. дзеячаў (1974, арх. Э.В.Ярзоўскі, Ю.Л.Пархаў, у інтэр'еры тэматычнае пано — маст. С.У.Курбатаў і інш.). Музеі: Рэсп. аб'яднаны (гіст.-краязнаўчы і выяўл. мастацтва) імя Бахзада, літ. імя С.Айні і імя М.Турсун-задэ, этнаграфічны.

ДУША́РА, у старажытнаарабскай міфалогіі вярхоўнае бажаство ў пантэоне *Набатэйскай дзяржавы*, апякун краіны і бог царскай дынастыі. Паводле міфа, народжаны дзевай-каменем; ідалам Д. служыў чорны камень, якому прыносілі ахвяру. Д. лічылі таксама богам-грамавержцам і атаясамлівалі з *Зеўсам*, *Дыянісам*, часам з *Арэсам*.

ДУШКЕ́ВІЧ Інэса Анатолеўна (н. 24.6.1959, Мінск), бел. артыстка балета. Нар. арт. Беларусі (1991). Скончыла Бел. харэагр. вучылішча (1977). З 1977 салістка Нац. акад. т-ра балета Беларусі.

І.А.Душкевіч.

Творчай індывідуальнасці Д. уласцівы шырокі акцёрскі дыяпазон, спалучэнне тэхн. віртуознасці з вял. пластычнай экспрэсіяй. Творчая вяршыня — партыя Рагнеды («Страсці» А.Мдывані; Дзярж. прэмія Беларусі 1996), пазначаная магутным трагедыйным гучаннем. Сярод інш. вобразаў у класічных і сучасных балетах: Адэта—Адылія, Маша, Аўрора («Лебядзінае возера», «Шчаўкунок», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Жызэль («Жызэль» А.Адана), Сільфіда («Сільфіда» Х.Левенскольда), Нікія і Кітры («Цені» і «Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Марыя і Зарэма («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Ундзіна («Ундзіна» Г.Генцэ), Кармэн («Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ—Р.Шчадрына), Ева («Стварэнне свету» А.Пятрова), Фрыгія («Спартак» А.Хачатурана), Джульета («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Каханая і Распусніца (вакальна-харэаграфічнае прадстаўленне «Карміна Бурана» на муз. К.Орфа), Дзяўчына («Балеро» М.Равеля), Дзева-выбранніца («Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага). Здымалася ў тэлеварыянтах спектакляў «Карміна Бурана», «Рамэо і Джульета», тэлефільме «Вяртанне вясны...». Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў балета (Масква, 1984). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1986.

І.Душкевіч у ролі Ундзіны.

І.Душкевіч у ролі Фрыгіі.

Літ.: Чурко Ю.М. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988. С. 147—151; Мушынская Т. «Лебедзь белы, лебедзь чорны...» // Беларусь. 1984. № 10; Яе ж. Мой лёс, мая любоў... // Мастацтва Беларусі. 1985. № 10; Яе ж. Трохі пра вечнае // Там жа. 1993. № 1.

Т.М.Мушынская.

ДУ́ШКІН Аляксей Мікалаевіч (24.12.1903, в. Аляксандраўка Харкаўскай вобл., Украіна — 1.10.1977), расійскі архітэктар. Скончыў Харкаўскі буд. ін-т (1930). Выкладаў у Маскоўскім арх. ін-це (1947—77; праф. 1966). З 1934 удзельнічаў у праектаванні станцый метрапалітэна ў Маскве («Крапоткінская», 1935, з арх. Я.Ліхтэнбергам; Дзярж. прэмія СССР 1941; «Аўтазаводская», 1940—43; Дзярж. прэмія СССР 1946, і інш.). Аўтар праектаў чыг. вакзалаў у Сімферопалі (1951), Сочы (1952) і інш., вышыннага будынка на Лермантаўскай пл. (1947—53, з Б.Мезенцавым; Дзярж. прэмія СССР 1949) і універмага «Дзіцячы свет» (1953—57) у Маскве.

ДУШНІКІ-ЗДРУЙ (Duszniki Zdrój), бальнеакліматычны курорт у Польшчы. На ПдУ ад г. Валбжых у Клодзскай катлавіне Цэнтр. Судэтаў. Мінер. крыніцы вядомы з 15 ст., як курорт развіваецца з 1800. Праводзіцца бальнеа- і клімататэрапія хвароб органаў стрававання, дыхання, гінекалагічных і інш. Пры лячэнні выкарыстоўваюць авечае малако і сыроватку, прыязныя тарфяныя гразі і інш. Лячэбныя ўстановы маюць н.-д. аддзяленні клінік Вроцлаўскай і Лодзінскай мед. акадэмій. Буйны цэнтр адпачынку, турызму і зімовага спорту. Курортны парк і тэатр імя Ф.Шапэна, арх.-гіст. помнікі 16—19 ст., музей папяровай вытв-сці.

ДУШЫ́ЦА (Acinos), род кветкавых раслін сям. ясноткавых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Міжземнамор'і і Паўд.-Зах. Азіі. На Беларусі трапляецца ўсюды Д. палявая (A. arvensis). Расце на сухіх сонечных месцах: на пясках, чыг. насыпах, каля дарог і інш.

Адна-, радзей шматгадовыя невысокія травяністыя расліны з простымі адзіночнымі або шматлікімі сцёбламі. Лісце дробнае, яйцападобнае або рамбічнае, клінападобна звужанае ў кароткі чаранок. Кветкі дробныя, фіялетава-пурпуровыя, у несапраўдных кальчаках, размешчаных у пазухах лістоў. Плод — чатырохарэшак. Меданосныя, эфіраалейныя і лек. расліны.

Г.У.Вынаеў.

ДУШЭ́ЎСКІ (Дуж-Душэўскі) Клаўдзій Сцяпанавіч [27.3 (паводле інш. звестак 26.4).1891, г. Глыбокае Віцебскай вобл. — 25.2.1959], бел. паліт. дзеяч. Вучыўся ў Пецярбургскім горным ін-це (1912—18), скончыў Літоўскі ун-т (1927, Каўнас). Адзін з актывістаў Бел. навук.-літ. гуртка студэнтаў Пецярбургскага ун-та. У 1917 уступіў у Бел. сацыяліст. грамаду (БСГ), у чэрв.— кастр. 1917 чл. яе ЦК і прэзідыума. Удзельнік з'езда бел. нац. арг-цый (сак. 1917, Мінск), Усерас. дэмакр. нарады (вер. 1917, Петраград) і інш. У 1918 заг. бежанскага аддзела Бел. нац. камісарыята. Пасля распаду БСГ (лета 1918) у Бел. партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. З 1919 у Вільні: чл. Бел. нац. к-та, старшыня Цэнтр. бел. рады Віленшчыны і Гродзеншчыны (май—ліп. 1919), узначальваў к-т Бел. т-ва дапамогі пацярпелым ад вайны, адзін з ініцыятараў стварэння Бел. вайсковай камісіі, дыпламат. прадстаўнік БНР у краінах Пры-

Душыца палявая.

балтыкі, дзярж. сакратар ва ўрадзе Ластоўскага. Выкладаў у Віленскай бел. гімназіі і на бел. настаўніцкіх курсах. У 1921 эмігрыраваў у Каўнас. У 1920—30-я г. працаваў у мін-вах бел. спраў, замежных спраў, сувязі Літвы, адзін з кіраўнікоў Бел. цэнтра ў Літве, Літ.-Бел. т-ва. Выдаваў і рэдагаваў час. «Беларускі сцяг» (1922), «Крывіч» (1923—26), «Беларускі асяродак» (з 1933). Пасля далучэння Літвы да СССР (ліп. 1940) зняволены сав. ўладамі ў турму; у жн. 1943 арыштаваны ням.-фаш. ўладамі і адпраўлены ў канцлагер. У 1944—46 дацэнт Каўнаскага ун-та. У 1952 сав. ўладамі асуджаны на 25 гадоў зняволення. Вызвалены ў 1955. *С.С.Рудовіч.*

ДУЭ́ЛЬ (франц. duel ад лац. duellum вайна), 1) паядынак 2 асоб (з выкарыстаннем зброі) як спосаб адстойвання гонару і асабістай годнасці. 2) Барацьба, спаборніцтва 2 бакоў.

ДУЭ́РА (Duero), партуг. Д о р у, рака ў Іспаніі і Партугаліі. Даўж. 925 км, пл. бас. каля 95 тыс. км^2. Вытокі ў Іберыйскіх гарах, у верхнім і сярэднім цячэнні ў глыбокай даліне перасякае Старакастыльскае пласкагор'е. Пры спуску да прыморскай нізіны ўтварае каньён, упадае ў Атлантычны ак. Вусце Д. — эстуарый, перагароджаны барам. Гал. прытокі: Пісуэрга, Адаха, Эсла, Тормес, Тамега. Сярэдні расход вады ў вусці каля 700 м^3/с (самая мнагаводная рака на Пірэнейскім п-ве). Зімова-веснавыя паводкі. Суднаходная на 200 км. ГЭС. Вадасховішча. На Д. — гарады Сорыя, Аранда-дэ-Дуэра, Самора (Іспанія), Порту (Партугалія).

ДУЭ́Т (італьян. duetto ад лац. duo два), 1) ансамбль з двух выканаўцаў. 2) Вакальная п'еса для двух галасоў з інстр. суправаджэннем. Часта сустракаецца ў оперы, араторыі, кантаце; у аперэце — вядучы від вак. ансамбля; існуе і як самаст. жанр камернай вак. музыкі. 3) Інстр. п'еса для двух выканаўцаў, а таксама для двух вядучых інстр. галасоў з суправаджэннем. Д. часта называюць і п'есы для аднаго фп. ў 4 рукі.

ДХАЎЛАГІ́РЫ, вяршыня ў Вял. Гімалаях, у Непале. Выш. 8221 м. Ледавікі. Пакарылі вяршыню швейц. альпіністы (А.Шэльберт і інш.) у 1960.

ДЫ... (грэч. di...), прыстаўка, якая абазначае «двойчы», «двайны», напр., *дыфтонг, дыёд, дымарфізм.*

ДЫАЗАЗЛУЧЭ́ННІ, арганічныя злучэнні, якія маюць групоўку з 2 атамаў азоту (N_2 — дыазагрупа), звязаную з адной арган. астачай. Вынайдзены ням. хімікам І.П.Грысам у 1857. Паводле хім. уласцівасцей адрозніваюць Д. аліфатычныя і араматычныя.

А л і ф а т ы ч н ы я Д. — дыазаалканы (агульная ф-ла $RR'CN_2$; дзе R, R' — алкіл ці вадарод) раскладаюцца пры награванні, дзеянні каталізатараў, кіслот; рэагуюць з вадой, галагенамі, галагенавадародамі з вылучэннем азоту. Найпрасцейшы прадстаўнік — дыазаметан. Выкарыстоўваюць як алкіліруючыя рэагенты (гл. *Алкіліраванне*). Атрутныя. А р а м а т ы ч н ы я Д. маюць агульную ф-лу ArN_2X, дзе Ar — арыл, X — гідраксільная група ці кіслотная астача. Найб. важныя — с о л і д ы а з о н і ю (напр., бензолдыазонійхларыд $C_6H_5N_2Cl$), бясколерныя цвёрдыя рэчывы, раскладаюцца пры награванні і мех. уздзеянні. Д. ўступаюць у рэакцыі з захаваннем дыазагрупы (напр., *азаспалучэнне*) і з вылучэннем азоту (абменьваюць дыазагрупу на інш.). Атрымліваюць узаемадзеяннем першасных араматычных амінаў пры т-ры 0—20 °С з азоцістай к-той (дыазатаванне). Выкарыстоўваюць у вытв-сці азафарбавальнікаў, лек. сродкаў, як святлоадчувальныя матэрыялы для вырабу фотарэзістараў і ў дыазатыпіі. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ДЫАКСА́Н, д ы э т ы л е н д ы а к с і д, цыклічны просты эфір, $O(CH_2)_4O$. Бясколерная вадкасць з эфірным пахам, $t_{пл}$ 11,3 °С, $t_{кіп}$ 101,32 °С, шчыльн. 1033, 61 кг/м^3 (30 °С). Змешваецца з вадой, спіртам, эфірам. Хім. ўласцівасцямі падобны да аліфатычных простых *эфіраў*. Выкарыстоўваюць як растваральнік ацэтылцэлюлозы, мінер. масел, алеяў, фарбаў, воскаў і інш. Таксічны, ГДК 10 мг/м^3.



ДЫАЛЕФІ́НЫ, гл. *Дыенавыя вуглевадароды.*

ДЫАМАФО́С, канцэнтраванае фосфарна-азотнае *мінеральнае ўгнаенне*, а таксама падкормка для жвачных жывёл. Адносіцца да *антыпірэнаў*. Асн. кампанент — гідраортафасфат амонію $(NH_4)_2HPO_4$. Атрымліваюць узаемадзеяннем ортафосфарнай к-ты з аміякам. Мае 18—19% азоту і 48—52% засваяльнага пентаакісду фосфару (гл. *Амафос*).

ДЫАМІ́Д, гл. *Гідразін.*

ДЫБА́Й, горад у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, гл. *Дубай.*

ДЫБАЛЁЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, гл. *Гарнасвечча.*

ДЫБЕ́НКА Павел Яфімавіч (28.2.1889, с. Людкаў Чарнігаўскай вобл., Украіна — 29.7.1938), савецкі ваен. дзеяч. Камандарм 2-га рангу (1935). Скончыў Ваен. акадэмію РСЧА (1922). З 1911 матрос Балт. флоту, у 1915—17 праследаваўся ўладамі за рэв. дзейнасць. Старшыня *Цэнтрабалта* (1917), удзельнічаў у падрыхтоўцы Кастр. рэвалюцыі 1917 (арыштаваў ген. П.М.*Краснова*). Чл. 1-га сав. ўрада, адзін з арганізатараў сав. ВМФ. З 1918 на камандных пасадах у Чырв. Арміі, удзельнік грамадз. вайны (ваяваў пераважна на Украіне), каманд. войскамі Сярэднеазіяцкай, Прыволжскай і Ленінградскай ваен. акруг (1928—38). Рэпрэсіраваны, рэабілітаваны пасмяротна. Аўтар успамінаў пра рэв. рух на Балт. флоце.

ДЫБІЯ́СІ (Dibiasi) Клаўс (н. 6.10.1947, г. Зольбад-Халь, Аўстрыя), італьянскі спартсмен (скачкі ў ваду). Алімпійскі чэмпіён (1968, 1972, 1976) і чэмпіён свету (1973, 1975) у скачках з вышкі. Чэмпіён Еўропы ў скачках з вышкі (1966, 1974) і трамплінa (1974). Пераможца спаборніцтваў на Кубак Еўропы ў скачках з вышкі (1965, 1967, 1975), трамплінa (1969, 1973, 1976), вышкі і трамплінa (1971).

ДЫБО́ЎСКІ Бенядзікт Іванавіч (30.4.1833, Мінская губ. — 31.1.1930), заолаг. Чл. Польскай АН (1884). Вывучаў медыцыну і прыродазнаўчыя навукі ў Тарту (1851—57), Вроцлаве (1857—58), Берліне (1858—60). З 1862 праф. кафедры заалогіі Варшаўскага ун-та. У 1864 за ўдзел у паўстанні 1863—64 сасланы ва Усх. Сібір, дзе пры падтрымцы Усх.-Сібірскага аддзела Рус. геагр. т-ва вывучаў фауну Прыбайкалля: апісаў фауну воз. Байкал і яго прыродныя ўмовы, фауну бас. р. Амур, берагоў Японскага м., Камчаткі, сабраў вял. калекцыю фауны Сібіры. У 1877 вярнуўся ў Польшчу. З 1879 зноў працаваў урачом у г. Петрапаўлаўск-Камчацкі, дзе працягваў даследаванні па зоагеаграфіі. У 1883—1906 заг. кафедры заалогіі ў Львоўскім ун-це.

ДЫБО́ЎСКІ Уладзіслаў Іванавіч (18.4.1838, маёнтак Адамарын Вілейскага пав., цяпер Маладзечанскі р-н — 27.7.1910), бел. заолаг, батанік, палеантолаг, мінералог і фальклярыст. Д-р мінералогіі (1878). Брат Б.І.*Дыбоўскага*. Скончыў Тартускі ун-т (1862). За ўдзел у паўстанні 1863—64 прыгавораны да турэмнага зняволення. З 1871 працаваў у Тартускім ун-це. З 1878 жыў у маёнтку Нянькава на Навагрудчыне. Аўтар прац па выкапнёвых рэштках Усх. Прыбалтыкі, Сібіры (матэрыялы дасылаў брат); даследаваў флору і фауну Навагрудчыны і інш. Збіраў бел. фальклор. У час. «Zbiór wiadomości do antropologii krajowej» («Збор звестак па айчыннай антрапалогіі») апублікаваў арт. «Беларускія прыказкі з Навагрудскага павета» (1881), «Беларускія загадкі з Мінскай губерні» (1886). *А.Ф.Літвіновіч.*

ДЫБУТЫЛФТАЛА́Т, д ы б у т ы л а в ы э ф і р *о*-ф т а л е в а й к і с л а т ы, араматычны эфір, $C_6H_4(COOC_4H_9)_2$. Бясколерная вадкасць з фруктовым пахам, $t_{кіп}$ 340 °С (кіпіць з раскладаннем), шчыльн. 1047 кг/м^3 (25 °С). Раствараецца ў спірце, эфіры, бензоле, ацэтоне, у вадзе — дрэнна. Хім. ўласцівасці характэрныя для эфіраў араматычных кіслот. Атрымліваюць узаемадзеяннем фталевага ангідрыту з *н*-бутанолам. Выкарыстоўваюць як пластыфікатар для пластмас, сінт. каўчуку, арган. шкла, выбуховых рэчываў; фіксатар паху і растваральнік для парфумы. Малатаксічны, ГДК у паветры 0,5 г/м^3, у вадзе вадаёмаў 0,2 мг/л.

ДЫВА́Н, мастацкі тэкстыльны выраб, звычайна з шматколерным узорам, прызначаны пераважна для ўпрыгожвання і ўцяплення жылля. Бываюць

Азербайджанскі **дыван** «куба». 19 ст.

Туркменскі **дыван** «бешыр». 1900.

ворсавыя і бязворсавыя (*кілімы*, паласы, *шпалеры*, *габелены*), маляваныя на тканіне, радзей паперы або цыраце. Вырабляюцца ручным спосабам, з сярэдзіны 19 ст. і машынным з воўны, шоўку, ільну, бавоўны, штучных валокнаў. Маст. асаблівасці вызначаюцца фактурай тканіны, характарам матэрыялу і фарбавальнікаў, фарматам, суадносінамі бардзюра і цэнтра поля Д., характарам і кампазіцыяй арнаменту, колеравым строем.

Найб. раннія Д. выяўлены пры раскопках Пазырыкскіх курганоў Горнага Алтая і датуюцца 5—4 ст. да н.э. Захаваліся звесткі пра Д. ў Асірыі, Вавілоне, Егіпце. З Д. Усходу найб. вядомы *іранскія, перс., туркм., азерб.* і інш. У Зах. Еўропе вядомы з 11 ст. (Д. з Баё, Францыя, і інш.). З 16 ст. асабліва месца займаюць шпалеры (флам., франц., нямецкія), у 17—18 ст. вылучаюцца ворсавыя Д. мануфактуры Саванеры (засн. ў 1624 у Парыжы). У 19 ст. з развіццём фарб. вытворчасці маст. ўзровень рэзка падае і пачынае адраджацца толькі з сярэдзіны 20 ст.

На Беларусі *дыванаткацтва* мае даўнія традыцыі, нац. характар узораў, кампазіцыі колераў, тэхнікі. Побач з дэкар. посцілкамі ткалі нар. Д., якімі ўпрыгожвалі жылыя памяшканні і ін-

Персідскі **дыван** «фараган». 19 ст.



Да арт. **Дыван**. У.Г у с е ў. Дыван «Арнаментальны». 1979. Брэсцкі дывановы камбінат.

Дыван маляваны. А.К і ш. Рай. 1930—40-я г.

Да арт. **Дыван**. Л.Ц ы б у л ь с к а я. Жакардавы дыван. 1984.

тэр'еры храмаў. Нар. бязворсавыя Д. ткалі ў тэхніцы кіліма, закладання, 2-асноўнай, тыпу габелена (напр., Гродзенскія падвойныя Д.). У розных раёнах мелі сваю традыц. расфарбоўку і арнамент. Ткалі Д. з геам. і раслін. арнаментам, антрапа- і зааморфнымі выявамі. У гарадах і мястэчках ткалі на заказ т. зв. дворскія бязворсавыя Д., блізкія па кампазіцыі да нар., або перайшлі зах.-еўрап. стылі і матывы дэкору. У 18 — 1-й пал. 19 ст. вылучаюцца вырабы *Гродзенскіх каралеўскіх мануфактур*, магнацкіх мануфактур у Нясвіжы, Міры, Карэлічах, Слоніме і інш., якія вызначаліся высокай тэхнікай ткацтва і прыгажосцю. З 19 ст. вядомасць набылі маляваныя Д., ствараліся на аснове багатых традыцый узорыстых тканых Д. і посцілак (творы А.Кіш, Я.Драздовіча і інш.). Маст. вобраз такіх Д. аналагічны творам наіўна-рэаліст. кірунку. Сучасныя нар. майстры вырабляюць і бязворсавыя Д. Ворсавыя Д. машыннага вырабу ствараюцца на прадпрыемствах акц. т-ваў *«Віцебскія дываны»* і *«Дываны Брэста»*. Гал. кірунак — стварэнне Д. з бел. арнаментам, што адпавядаюць сучаснаму інтэр'еру па стылявым і колеравым вырашэнні. Бел. Д. экспанаваліся на міжнар. выстаўках у Германіі, Італіі, Польшчы, Інданезіі, дзе адзначаны дыпломамі. Вырабы акц. т-ва «Дываны Брэста» ўзнагароджаны брыльянтавай зоркай у Мексіцы (1994) і «Залатой аркай» у Іспаніі (1995).

Туркецкі **дыван** «кула». 17 ст.

Дыван маляваны з Мядзельскага раёна Мінскай вобл. 1950-я г.

Літ.: Трызна Дз.С. Беларускія дываны і габелены. Мн., 1981; Mańkowski T. Dawnie tkaniny i hafty w Polsce w XVI—XVIII w. Wrocław, 1954; Моран А. де. История декоративно-прикладного искусства: От древнейших времен до наших дней: [Пер. с фр.]. М., 1982.

ДЫВА́Н (перс. канцылярыя, установа), у мусульманскіх краінах у сярэдневякоўі падаткова-фін. ведамства. У Асманскай імперыі і некат. іншых краінах — рада пры кіраўніку дзяржавы. У некат. сучасных дзяржавах Б. і Сярэдняга Усходу — урадавыя ўстановы па адм. і суд. справах.

ДЫВАНАТКА́ЦТВА, ручное ці машыннае тканне *дываноў* і дывановых вырабаў (*габеленаў*, *шпалераў*, дарожак і інш.). У Д. выкарыстоўваюцца шэрсць, баваўняныя, ільняныя і хім. валокны. Асн. аперацыі: падбор валакністых матэрыялаў, фарбаванне пражы і валакна, тканне і апрацоўка дываноў.

Ручное ткацтва робіцца на верт. або гарыз. варштатах. Выконваецца па нац. узорах або малюнках, зробленых фарбай на спец. паперы ў клетку. Ручныя ворсавыя дываны — шматслойная тканіна палатнянага (міткалёвага) перапляцення трох сістэм нітак — асноўнай, уточнай і ворсавай. Каркаснае палатно тканіны ствараецца перапляценнем асновы і ўтку; вонкавы слой (малюнак дывана) — каляровымі ворсавымі ніткамі, вузлы якіх шчыльна звязваюцца ў гарыз. або верт. парадку на нітках асновы. Бязворсавыя дываны — аднаслойная тканіна, зробленая перапляценнем нітак асновы і рознакаляровых нітак утку. Дываны машыннай вытв-сці падзяляюцца на бязворсавыя (простай і складанай будовы) і ворсавыя. Дываны простай будовы вырабляюцца з адной сістэмы асновы і адной сістэмы ўтку. Узор вытыкаецца на ткацкім станку з *Жакарда машынай*. Бязворсавыя дываны складанай будовы — гэта двух- або трохслойная тканіна з некалькіх сістэм шарсцяной, баваўнянай ці льняной асновы і шарсцянога ўтку, які стварае ўзор. Найб. вядомыя з такіх дываноў шатландскія і т.зв. «кідэрмінстэрскія» (ням. і англ.). Ворсавыя дываны вырабляюцца звычайна з асноўным, радзей з уточным ворсам. Паводле спосабу ўтварэння асн. ворсу адрозніваюць дываны двухпалотныя з разразным ворсам і т. зв. прутковыя (аднапалотныя). Двухпалотную шматслойную тканіну фармуюць на двухпалотным станку ніткамі карэннай насцільнай і ворсавай асноў і ўтку. Потым ніжняе і верхняе палотны, злучаныя ворсавымі петлямі, разразаюць па ворсавых нітках на 2 дываны. Прутковыя дываны робяць на аднапалотных станках з жакардавымі машынамі (пры набіўных дыванах — без іх). Гатовыя дываны апрацоўваюць, надаюць ім шаўкавісты бляск, змякчаюць фарбавыя тоны ворсавай пражы, ліквідуюць дэфекты тканння і інш.

На Беларусі ворсавыя дываны машыннага вырабу ствараюцца на прадпрыемствах акц. т-ваў *«Віцебскія дываны»* і *«Дываны Брэста»*.

ДЫВАНО́ВЫЯ РАСЛІ́НЫ, нізкарослыя, часцей паўзучыя травяністыя расліны з разнастайна афарбаваным ліс-цем, якія выкарыстоўваюць у дэкар.



Да арт. **Дыванаткацтва**: *а* — вязка вузлоў (двайных і паўтарачных) у ручным дыванаткацтве (1 — гарызантальная, 2 — вертыкальная); *б* — схема перапляценняў бязворсавых дываноў (1 — палас, 2 — кілім); *в* — структура двухпалотных дываноў (1, 2, 3 — карэнная, насцільная і ворсавая асновы; 4 — ніткі ўтку; 5 — нож).

Да арт. **Дыванаткацтва**. Двухпалотны дыванаткацкі станок з машынай Жакарда.

кветкаводстве для стварэння дывановых кветнікаў. Выш. звычайна 5—15 см. Большасць Д.р. шматгадовыя. На Беларусі як Д.р. выкарыстоўваюць многія віды агатак, агератуму, альтэрнантэры, бягоніі, ірэзінэ, палыну, партулаку і інш. Размнажаюць пераважна чаранкамі. Догляд за Д.р.: паліўка, падстрыганне і пасынкаванне.

«ДЫВАНЫ́ БРЭ́СТА», адкрытае акцыянернае таварыства ў г. Брэст. Пачало

Схіл з **дывановымі** раслінамі каля станцыі метро «Кастрычніцкая» ў Мінску.

дзейнічаць у 1960 як Брэсцкі дывановы камбінат. У 1970 на базе дывановага камбіната і Брэсцкай суконнай ф-кі створана дыванова-суконнае аб'яднанне. З 1984 дывановае вытв. аб'яднанне. З 1993 сучасная назва. У «Д.Б.» ўваходзяць прадзільная і ткацка-аддзелачная ф-кі. Працуе на мясц. і прывазной сыравіне. Асн. прадукцыя (1997): апаратная пража розных відаў (чысташарсцяная, паўшарсцяная і інш.), жакардавыя дываны і дывановыя вырабы.

ДЫВЕРГЕ́НЦЫЯ (ад позналац. divergentia разыходжанне) у б і я л о г і і, разыходжанне прыкмет і ўласцівасцей у першапачаткова блізкіх груп арганізмаў у працэсе іх эвалюцыі. Тэрмін увёў Ч.Дарвін (1859) для тлумачэння ўзнікнення сартоў культ. раслін, парод свойскіх жывёл і біял. відаў у прыродзе. Адбываецца пад уздзеяннем розных умоў існавання, у выніку чаго з аднаго зыходнага віду ўтвараюцца новыя разнавіднасці або віды. Процілегласць Д. — *канвергенцыя*.

ДЫВЕРГЕ́НЦЫЯ ў м а т э м а т ы ц ы, скалярная велічыня, якая характарызуе шчыльнасць крыніц некат. вектарнага поля, зададзенага адпаведнай *вектар-функцыяй* $\vec{a}=\vec{a}(x, y, z)$. Абазначаецца *div* $\vec{a}$ або $\nabla\cdot\vec{a}$, дзе $\nabla=\vec{i}\frac{\partial}{\partial x}+\vec{j}\frac{\partial}{\partial y}+\vec{k}\frac{\partial}{\partial z}$ — аператар Гамільтана (аператар набла), $\vec{i}\ \vec{j}\ \vec{k}$ — орты прамавугольнай дэкартавай сістэмы каардынат, $div\vec{a}=\frac{\partial a_x}{\partial x}+\frac{\partial a_y}{\partial y}+\frac{\partial a_z}{\partial z}$. Паняцце выкарыстоўваецца ў механіцы, фізіцы, метэаралогіі і інш. Гл. таксама *Поля тэорыя*.

ДЫВЕРГЕ́НЦЫЯ ў м о в а з н а ў с т в е, разыходжанне, узаемнае аддаленне роднасных моў або дыялектаў адной мовы (напр., Д. *індаеўрапейскіх моў* пасля распаду індаеўрап. *прамовы*; Д. ўсх.-слав. дыялектаў праслав. мовы, што прывяло да фарміравання бел., укр. і рус. моў і інш.). Д. абумоўліваецца самастойнасцю развіцця роднасных этнасаў, што звязана са зменамі сац. умоў іх існавання (міграцыі, перамены ў моўнаэтнічным акружэнні пэўнага этнасу, уваходжанне роднасных этнасаў у розныя дзярж. або культ.-рэліг. ўтварэнні і інш.). Д. адбываецца шляхам паступовых змен на ўсіх моўных узроўнях (фанетыка, фаналогія, граматыка, лексіка). Д. і супрацьлеглая ёй *канвергенцыя* — розднакіраваныя і ўзаемазвязаныя працэсы, якія вядуць да ўзнікнення новых моў ці *моўных саюзаў*.

Літ.: В а й н р а й х У. Языковые контакты: Пер. з англ. Киев, 1979; Теоретические основы классификации языков мира. М., 1980; Ц ы х у н Г.А. Тыпалогія сінтаксічных адрозненняў у балканаславянскім арэале: [VIII Міжнар. з'езд славістаў: Дакл.]. Мн., 1978. *Н.Б.Мячкоўская.*

ДЫВЕРСІФІКА́ЦЫЯ (лац. diversificatio ад diversus розны + facio раблю), разнастайнасць, рознабаковасць у развіцці. Д. ў э к а н о м і ц ы — размеркаванне інвеставаных або пазычаных грашовых капіталаў паміж рознымі аб'ектамі ўкладанняў з мэтай змяншэння рызыкі магчымых страт капіталу або даходаў ад яго. Д. в ы т в о р ч а с ц і — адначасовае развіццё многіх, не звязаных адзін з адным відаў вытв-сці, расшырэнне асартыменту вырабаў.

ДЫВЕ́РСІЯ (ад лац. diversio адхіленне, адцягванне ўвагі), 1) падрыўныя дзеянні (падпалы, разбурэнні і да т.п.), зробленыя спецыяльна падрыхтаванымі агентамі або групамі ў мірны і ваенны час на тэрыторыі якой-н. дзяржавы або тэрыторыі, захопленай праціўнікам, з мэтай аслаблення яго эканам. і ваен. магутнасці, маральнага стану. 2) У КК Рэспублікі Беларусь Д. — дзярж. злачынства, якое выяўляецца ва ўчыненні выбухаў, падпалаў, інш. дзеянняў, што маглі выклікаць гібель людзей ці інш. шкоду іх жыццю і здароўю, разбурэнне або пашкоджанне аб'ектаў нар. гаспадаркі з мэтай нанясення ўрону эканам. бяспецы і абараназдольнасці дзяржавы. Караецца пазбаўленнем волі ад 10 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці, а калі Д. прывяла да гібелі людзей або інш. асабліва цяжкіх вынікаў ці ўчынена арганізаванай групай — пазбаўленнем волі ад 15 да 25 гадоў, або пажыццёвым зняволеннем, ці пакараннем смерцю з канфіскацыяй маёмасці. *Э.І.Кузьмянкова.*

ДЫВЕРТЫ́КУЛ (ад лац. diverticulum дарога ў бок, адхіленне), прыроджанае ці набытае выпучванне сценкі полага органа чалавека ў выглядзе мяшка. Найчасцей бывае Д. стрававода, мачавога пузыра, радзей — дванаццаціперснай кішкі, страўніка. Прыроджаны Д. звязаны з заганамі развіцця органа, набыты — з прычыны ціску з поласці органа на яго сценку. Можа развівацца пры хваробах суседніх органаў. Запаленне сценак Д. — д ы в е р т ы к у л і т (катаральны, язвавы, флегманозны; магчымы прабадзенні Д.). Лячэнне залежыць ад лакалізацыі і цячэння Д., іншы раз хірургічнае.

ДЫВЕРТЫСМЕ́НТ (франц. divertissement літар. забава, развесяленне), 1) устаўныя, пераважна вак.-харэаграфічныя нумары, у драм., оперных і балетных

Да арт. **«Дываны Брэста»**. Дыван «Беларусь». Мастак А.Гаўрыленка.

спектаклях у 17—19 ст. Выконваліся паміж актамі спектакля, як правіла, не былі звязаны з яго сюжэтам. 2) Праграма з нумароў розных жанраў (папулярныя арыі, куплеты, танцы, камічныя маналогі і сцэнкі і інш.). З 17 ст. паказвалася ў драм. т-ры пасля заканчэння асн. п'есы. 3) Устаўная муз.-харэаграфічная кампазіцыя (балетная сюіта) унутры опернага ці балетнага спектакля. Уключаецца звычайна для паказу выканальніцкіх магчымасцей салістаў, раскрыцця асн. рыс вобразаў, якія ўвасабляюцца. Вядомы з 17 ст., сустракаюцца і ў 19—20 ст. (рысы дывертысментнасці ёсць у оперы «Кветка шчасця» А.Туранкова, балетах «Падстаўная нявеста» Г.Вагнера, «Выбранніца» Я.Глебава і інш.). 4) З 17 ст. інстр. і вакальныя муз. творы развесяляльнага характару. З 18 ст. адна з цыклічных формаў інстр. музыкі для камернага ансамбля ці аркестра і для аднаго інструмента (І.Гайдн, В.А.Моцарт і інш.). Спалучае рысы *санаты* і *сюіты*, блізкі да *серэнады*, касацыі, *накцюрна*. Узнік у камедыі-балеце, камічных операх 17—18 ст. (Ж.Б.Люлі, Ж.Ф.Рамо, К.В.Глюк), вядомы і ў больш позніх шматактовых операх і балетах. 5) Свабодная інтэрмедыя ўнутры *фугі* (у замежнай муз. тэорыі).

ДЫВІДЭ́НД (ад лац. dividendus падлеглы падзелу), частка агульнай сумы чыстага прыбытку акц. т-ва, што размяркоўваецца паміж акцыянерамі ў адпаведнасці з акцыямі, якія ў іх ёсць. Даходы акцыянерам выплачваюцца наяўнымі грашамі або акцыямі. Памеры Д. вар'іруюцца для звычайных і застаюцца фіксаванымі для прывілеяваных акцый. Калі становішча кампаніі пагаршаецца, яна можа выплачваць Д. з атрыманых раней даходаў. Лічба, што паказвае, у колькі разоў прыбытак кампаніі перавышае суму Д., якую яна выплачвае, называецца пакрыццём па Д.

ДЫВІЗІЁН (франц. division ад лац. divisio дзяленне, раздзяленне), асноўнае тактычнае і агнявое падраздзяленне ў ракетных войсках і артылерыі сучасных армій, а таксама ў ВМФ. Уваходзіць у склад часці (злучэння), можа быць асобным. Звычайны склад Д. ракетных войск і артылерыі — 2—4 агнявыя батарэі і падраздзяленні кіравання і забеспячэння. У ВМФ — злучэнне аднатыпных караблёў ніжэйшых рангаў (мінаносцаў, тарпедных катэраў і да т.п.).

ДЫВІЗІЯ, асноўнае тактычнае злучэнне ў розных відах узбр. сіл многіх дзяржаў. Па прыналежнасці да відаў узбр. сіл, родаў войск, прызначэнні, арг-цыі і ўзбраенні ў гісторыі будаўніцтва ўзбр. сіл вядомы Д.: пяхотныя, стралк., мотастралк., матарызаваныя, механізаваныя, кав., танк. (бранятанкавыя), артыл., авіяц., паветрана-дэсантныя, дэсантна-штурмавыя, ППА, марской пяхоты і інш. Прызначаны для вядзення бою ў складзе больш буйных фарміраванняў (армія, корпус і інш.), а ў некат. выпадках і самастойна. Д. сухапутных узбр. сіл складаюцца з палкоў, брыгад, батальёнаў і інш. вайск. падраздзяленняў. Стралк. Д. ўзбр. сіл СССР часоў 2-й сусв. вайны мела ў сваім складзе 3 стралк. палкі, артыл. брыгаду, самаходна-артыл. і зенітна-артыл. дывізіёны, сапёрны і вучэбны батальёны, батальён сувязі і інш. падраздзяленні. У пасляваен. перыяд у стралк. Д. ўведзены танка-самаходны полк, павялічылася яе рухомасць і агнявая магутнасць; стралк. Д. перафарміраваны ў мотастралковыя.

У ВПС многіх дзяржаў ёсць авіяц. Д. для падтрымкі сухап. войск з паветра, паветр. разведкі і выканання інш. задач. Звычайна авіяц. Д. маюць некалькі авіяц. палкоў або эскадраў аднаго роду авіяцыі ад 45 да 200 і больш самалётаў. У ВМФ Д. караблёў прызначана для вядзення самаст. баявых дзеянняў на марскіх прасторах або пры ўзаемадзеянні з інш. злучэннямі караблёў. Могуць складацца з некалькіх караблёў 1-га рангу і інш. меншых баявых адзінак. Падзяляюцца на Д. надводных і падводных караблёў.

ДЫВІЗІЯНІ́ЗМ у мастацтве, гл. *Пуантылізм.*

ДЫВІНІ́Л, гл. *Бутадыен.*

ДЫВІНІ́ЛАВЫЯ КАЎЧУКІ́, гл. *Бутадыенавыя каўчукі.*

ДЫВІНІ́Л-НІТРЫ́ЛЬНЫЯ КАЎЧУКІ́, гл. *Бутадыен-нітрыльныя каўчукі.*

ДЫВІНІ́Л-СТЫРО́ЛЬНЫЯ КАЎЧУКІ́, гл. *Бутадыен-стырольныя каўчукі.*

ДЫ́ГЕРЫ (англ. diggers літар. капальнікі), прадстаўнікі сялянскага руху ў перыяд *Англійскіх рэвалюцый 17 стагоддзя*. Рух створаны ў 1649 беззямельнымі сялянамі, якія занялі пустэльныя землі ў графстве Сюрэй і заснавалі с.-г. абшчыну. Кіраўнік і гал. ідэолаг Дж.*Уінстэнлі* абвясціў праграму стварэння бясклассавага грамадства, ідэал калект. уласнасці і калект. працы. У 1650 камуну разагналі мясц. землеўладальнікі. Падобныя абшчыны ўзніклі таксама ў інш. графствах. Д. называлі сябе таксама сапр. *левелерамі*, але кіраўнікі левелераў не прымалі іх камуніст. ідэі. Рух. Д. канчаткова быў задушаны ў 1653 О.*Кромвелем*.

ДЫГЕ́СТЫ (лац. digesta), зборнік сістэматычна сабраных і тэматычна аднародных вытрымак з твораў рымскіх класічных юрыстаў. Вядомы з 533 як асн. частка *кадыфікацыі Юстыніяна*. Найважнейшая крыніца звестак пра *рымскае права*.

ДЫГІТА́ЙЗЕР (англ. digitizer), перыферыйная прылада ЭВМ для ўводу графічнай інфармацыі з нефермагнітных носьбітаў (карты і планы мясцовасці, чарцяжы, графікі і інш.). Дазваляе ўводзіць факсімільную і рукапісную інфармацыю, рашаць задачы ідэнтыфікацыі аб'ектаў, працаваць з меню камандаў, кіраваць маркёрам на экране дысплея і інш. Выкарыстоўваецца таксама ў сістэмах уводу інфармацыі ў банкаўскай і дзелавой галінах, крыміналістыцы і інш. замест буйнафарматных *сканераў* з мех. прыводам каардынатнай прывязкі.

Д. мае планшэт, на якім размяшчаецца зыходны матэрыял, і элемент здымання інфармацыі (паказальнік каардынат); каардынатная сістэма Д. мадэлюецца рознымі фіз. палямі (эл.-магн., акустычным, рэзістыўным і інш.). Паказальнікі каардынат бываюць стрыжнёвай канструкцыі з пішучымі наканечнікамі (або без іх) ці сплошчанай формы з аптычна празрыстымі візірнымі перакрыжаваннямі (часам з дадатковымі прыстасаваннямі павелічэння і падсвечвання відарысаў). Стрыжнёвыя паказальнікі могуць быць адчувальнымі да сілы націскання (да 256 градацый, якім могуць адпавядаць таўшчыня ліній, колер і яго адценні ў палітры і інш.); маюць 1—2 (курсоры — да 16) кнопкі кіравання рэжымам уводу інфармацыі. Раздзяляльная здольнасць Д. да 0,0125 мм, дакладнасць да 0,1 мм, скорасць уводу інфармацыі не менш як 100 пунктаў за секунду. На Беларусі Д. распрацаваны і ўкаранёны ў вытв-сць у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН.

Літ.: Алексеев Г.И. Электромагнитные планшетные устройства ввода. Мн., 1985. *Г.І.Аляксееў.*

ДЫГРА́Ф (ад *ды...* + *...граф*), спалучэнне 2 літар, што ўжываецца для абазначэння на пісьме пэўнага гуку. Уласцівы кірыліцы (Д. «оу» абазначаў просты гук «у»). У помніках старабел. мовы 14—17 ст. ужываліся Д. «кг» на месцы «г» (кгузикъ), «іо» — «ё» (ліонъ), «хв» — «ф» (Тимохвѣй), «дж» (дроджи), «дз» (дзедзіч). Сучаснай бел. мове ўласцівы Д. «дз» і «дж». Спалучэннямі з 2 і больш літар перадаюцца ў некат. зах.-еўрап. сістэмах пісьма звычныя гукі, блізкія да ўсх.-слав. «х», «ч», «ш», «щ» (ням. ch, tsch, sch, schtsch; польск. ch, cz, sz, czcz). *М.Р.Прыгодзіч.*

ДЫГРЭ́СІЯ (ад лац. digressio адхіленне) рэкрэацыйная, пагаршэнне стану прыродных комплексаў (пераважна ў лесапарках, зонах адпачынку, прыгарадных лясах) пад уплывам інтэнсіўнага іх выкарыстання. З'явы Д. ўзнікаюць пры перавышэнні *гранічна-дапушчальных рэкрэацыйных нагрузак*, як вынік вытоптвання расліннага покрыва, ушчыльнення глебы, абломлівання дрэў і кустоў, апёкаў глебы ад вогнішчаў, распуджвання жывёл, неўпарадкаванага збору грыбоў, кветак, ягад, засмечвання асяроддзя арган. і мінер. рэчывамі антрапагеннага паходжання. Мех. ўздзеянні, асабліва вытоптванне, найб. адчувальныя і пастаянныя фактары Д. З мэтай рэгламентацыі рэкрэацыйных нагрузак вылучаюць 5 стадый Д. 1—3-й стадыям уласцівы адмоўныя, але абарачальныя змены, пераважна ў раслінным і жывёльным свеце; на 4-й і 5-й стадыях закранаюцца глебава-грунтавыя і гідралагічныя ўмовы з фарміраваннем і нарастаннем неабарачальных працэсаў разбурэння біягеацэнозаў.

ДЫГУ́Л (Digul), рака на Пд в-ва Новая Гвінея, у Інданезіі. Даўж. каля 600 км,

пл. басейна каля 23 тыс. км². Пачынаецца ў гарах Джаяві́джая, цячэ па забалочанай нізіне ў звілістым рэчышчы, упадае ў Арафурскае м. Паўнаводная на працягу ўсяго года. Сярэдні расход вады каля 1600 м³/с. Суднаходная.

ДЫДАКТАГЕНІ́Я, негатыўны псіхічны стан вучня, выкліканы парушэннем пед. такту з боку выхавальніка (настаўніка, трэнера). Выяўляецца ў *фрустрацыі*, страху, прыгнечаным настроі і інш. Адмоўна ўплывае на дзейнасць вучня, ускладняе міжасобасныя адносіны. У аснове ўзнікнення Д. — псіхічная траўма, атрыманая вучнем па віне педагога. Д. можа стаць прычынай *неўрозаў*. Каб прадухіліць узнікненне Д., педагог павінен імкнуцца да макс. тактоўнасці ў абыходжанні, улічваць узроставыя і індывідуальна-псіхал. асаблівасці вучняў.

ДЫДА́КТЫКА (ад грэч. didaktikos павучальны, які датычыць вучобы), галіна педагогікі, якая распрацоўвае тэорыю адукацыі і выхавання ў працэсе навучання. Адным з першых тэрмін «Д.» ўжыў *Я.А.Каменскі* ў працы «Вялікая дыдактыка» (1657). Прадмет даследавання Д. — мэты, змест, заканамернасці, формы і прынцыпы навучання. Вырашэнне гэтых агульнатэарэтычных пытанняў дае падставу для распрацоўкі канкрэтных навуч. праграм, арганізац. формаў і сродкаў навучання. Д. арганічна звязана з філасофіяй, фізіялогіяй, сацыялогіяй і інш. Тэорыя і практыка выкладання асобных дысцыплін вывучаецца прыватнымі Д. (Д. матэматыкі, Д. фізікі, Д. бел. мовы і інш.). Усе яны абапіраюцца на здабыткі асобных навук і грунтуюцца на іх дасягненнях. Мэта адукацыі накіравана на ўсебаковае развіццё асобы, забеспячэнне свядомага і трывалага засваення ведаў асноў навук, авалодання ўменнем карыстацца гэтымі ведамі на практыцы, творча выкарыстоўваць іх для вырашэння новых праблем. Яна разглядаецца ў адзінстве з мэтамі выхавання, накіраванага на фарміраванне асобы вучня, далучэнне школьнікаў да самаадукацыі і самавыхавання. Мэты адукацыі вызначаюць яе змест. У сучаснай школе ён уключае сістэму ведаў аб прыродзе, грамадстве, тэхніцы, чалавеку; сістэму спосабаў дзейнасці, што ў выніку засваення становяцца уменнямі і навыкамі; вопыт творчай дзейнасці, які забяспечвае развіццё творчых здольнасцей вучняў; сістэму нормаў адносін да сусвету і паміж сабой, што ў сукупнасці забяспечвае накіраванасць асобы, яе маральную, эстэт., эмацыянальную культуру, каштоўнасці і ідэалы. Дасягненне мэт магчыма пры выкананні пэўных дыдактычных прынцыпаў. Асн. прынцыпы Д.: прынцып навуковасці прадугледжвае, што змест адукацыі павінен уяўляць сабой сістэму ведаў і ісцін, выяўленых навукай; прынцып даступнасці прадугледжвае такі ўзровень цяжкасці вучэбнага матэрыялу, які адпавядаў бы магчымасцям вучня; прынцып наглядна сці прадугледжвае, абапіраючыся на дапаможныя сродкі, дамагчыся яснага разумення і засваення вучнямі вучэбнага матэрыялу; прынцып сістэматычнасці патрабуе паслядоўнасці ў вывучэнні і пераемнасці, што забяспечвае трываласць ведаў; прынцып свядомасці і актыўнасці засн. на ўсведамленні вучнем, што набыццё ведаў цалкам залежыць ад яго асабістай пазнавальнай актыўнасці, бачання мэты і перспектыў навучання; прынцып спалучэння тэорыі з практыкай азначае, што веды павінны мець рэальную жыццёвую аснову, стварацца на падставе вопыту і замацоўвацца ў ім; прынцып аптымізацыі патрабуе найлепшага выкарыстання ўсіх звёнаў вучэбнага працэсу з абавязковым улікам індывід. асаблівасцей кожнага вучня. У Беларусі даследаванні ў галіне Д. праводзяцца ў Нац. ін-це адукацыі і ВНУ.

Літ.: Оконь В. Введение в общую дидактику: Пер. с пол. М., 1990.

В.М.Навумчык.

ДЫДАКТЫ́ЧНАЯ ЛІТАРАТУ́РА, літаратурныя творы розных жанраў павучальнага характару. Выкарыстоўвае мастацкую (пераважна вершаваную) форму для выкладу навук., філас., маральных, рэліг. ведаў і ідэй. Уключае жанры: дыдактычны эпас (вершаваныя навук. паэмы), апавяд. жанры (павучальныя аповесці, *байка*, *прытча*, апалог, *афарызм*), дыдакт. лірыку (вершаваныя *выслоўі*, павучальныя *пасланні*) і драму (*маралітэ*, міракль, *школьная драма*) і інш.

Вытокі Д.л. ў фальклоры, рэліг. пропаведзях, *павучаннях*, *аратарскай прозе*. Вядома ў л-рах Стараж. Індыі («Панчатантра»), Кітая (трактаты Канфуцыя), Ірана (трактаты Заратуштры), стараж.-яўрэйскай (прытчы Саламона) і антычнай («Турботы і дні» Гесіёда, «Пра сутнасць рэчаў» Лукрэцыя).

У л-ру Кіеўскай Русі прыйшла з прынятым хрысціянства. Элементы дыдактыкі ўласцівы стараж.-рус. («*Павучанне Уладзіміра Манамаха*») і бел. перакладной («*Гісторыя пра Варлаама і Іасафа*», «*Вялікае зярцала*»), арыгінальнай (творы Кірылы Тураўскага, Ф.Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага), некат. творам агіяграфічнай л-ры (гл. *Жыціе*). Моцны дыдактычны пачатак у палемічнай л-ры («Апакрысіс» Х.Філалета, «Трэнас» М.Сматрыцкага, «Дыярыуш» А.Філіповіча), творчасці Сімяона Полацкага. У 19 ст. аддзяляецца ад маст. л-ры. У наш час паняцце Д.л. набывае адмоўны эстэт. сэнс.

Г.Я.Адамовіч.

ДЫДО́НА, Э л і с а, у рымскай міфалогіі царыца, заснавальніца Карфагена, дачка цара Тыра, жонка і сястра цара Сіхея. Брат Д., Пігмаліён, забіў Сіхея, каб захапіць яго багацце, але Д. ўцякла са скарбамі ў Афрыку. Мясцовы бербейскі цар Ярба падараваў ёй крыху зямлі — столькі, колькі зойме шкура вала. Хітрая Д. разрэзала шкуру на вузкія палоскі, абкружыла імі вял. ўчастак зямлі і заснавала горад-крэпасць Карфаген. Пазней пакахала Энея, закінутага навальніцай у Карфаген, і пасля яго ад'езду скончыла самагубствам. Да міфа аб Д. звярталіся скульптары і мастакі (А.Мантэнья, Л.Карачы, П.П.Рубенс), літаратары (Г.Сакс, Я.Б.Княжнін, бел. паэма «Энеіда навыварат»), кампазітары (Г.Пёрсел, А.Скарлаці, Г.Ф.Гендэль, І.Гайдн) і інш.

ДЫДЫ́РКА Уладзімір Кандратавіч (22.9.1877, с. Дахноўка Чаркаскай вобл., Украіна — 15.3.1938), бел. матэматык. Праф. (1931). Скончыў Кіеўскі (1900) і Маскоўскі (1902) ун-ты. З 1902 у Мінскай мужчынскай гімназіі, з 1918 у Мінскім ін-це нар. адукацыі, з 1920 у БПІ, з 1922 у БДУ. Удзельнік навук. семінараў пад кіраўніцтвам Д.Гільберта (1928, Гётынген, Германія). Навук. працы па аналітычнай геаметрыі. Аўтар манаграфіі «Цыркулярныя крывыя трэцяга парадку» (1928—32). Неабгрунтавана рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

Літ.: В.К.Дыдырко // Вест. БГУ. Сер. 1. 1978. № 3.

А.А.Гусак.

ДЫДЫ́ШКА Аляксандр Іванавіч (1.7.1911, г. Верхнедняпроўск, Украіна — 5.2.1944), Герой Сав. Саюза (1940). Беларус. Скончыў Адэскае артыл. вучылішча (1933). У Чырв. Арміі з 1929. Вызначыўся ў сав.-фінл. вайну 1939—40: артыл. дывізіён на чале з капітанам Д. у баях на Карэльскім перашыйку нанёс праціўніку значныя страты ў баявой тэхніцы і жывой сіле. У Вял. Айч. вайну ўдзельнік абароны Масквы, вызвалення Калінінскай, Смаленскай і Віцебскай абласцей. Загінуў у баі за г. Гарадок Віцебскай вобл.

ДЫДЫ́ШКА Вячаслаў Іосіфавіч (н. 10.3.1949, в. Ліпск Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. спартсмен (шахматы). Міжнар. гросмайстар (1995). Скончыў БДУ (1973). З 1992 спартсмен-інструктар нац. зборнай каманды па шахматах. Чэмпіён Беларусі па шахматах у 1965, 1971, 1973, 1979, 1980, 1982, 1988, 1992. Пераможца міжнар. турніру «Берлінскае лета» (1995) і інш.

Тв.: Логика современных шахмат. Мн., 1989.

ДЫЕ́З, гл. ў арт. *Альтэрацыя*.

ДЫЕ́НАВЫ СІ́НТЭЗ, Д з і л ь с а — А л ь д э р а р э а к ц ы я, рэакцыя 1,4-далучэння да злучэнняў са спалучанымі кратнымі сувязямі (дыенаў) рэчываў з актываванай кратнай сувяззю (дыенафілаў). Як агульная рэакцыя арган. хіміі Д.с. адкрыты *О.Дзільсам* і *К.Альдэрам* (1928).



У выніку Д.с. ўтвараюцца 6-членныя цыклы, напр., з бутадыену-1,3 (I) і малеінавага ангідрыту (II) атрымліваюць ангідрыд тэтрагідрафталевай к-ты (III). Звычайна дыенафіламі з'яўляюцца вытворныя *алкенаў* і *алкінаў*, кратная сувязь якіх актывавана суседняй электронаакцэптарнай групай (напр., $=CO$, $—COOH$, $—NO_2$ і інш.), а таксама рэчывы, малекулы якіх маюць групы $—C\equiv N$, $—N=N—$, $=C=N—$, $=S=O$ і інш., дыенамі — ацыклічныя і цыклічныя 1,3-дыены (гл. *Дыенавыя вуглевадароды*), *араматычныя злучэнні*, *гетэрацыклічныя злучэнні*. Выкарыстоўваецца для сінтэзу поліцыклічных рэчываў, у т.л. стэроідаў. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ДЫЕ́НАВЫЯ ВУГЛЕВАДАРО́ДЫ, дыены, дыалефіны, ненасычаныя вуглевадароды з 2 падвойнымі сувязямі ў малекуле. Аліфатычныя Д.в. (агульная ф-ла C_nH_{2n-2}, дзе n — колькасць атамаў вугляроду) наз. алкадыенамі, аліцыклічныя Д.в. (C_nH_{2n-4}) — цыклаалкадыенамі. У залежнасці ад узаемнага размяшчэння падвойных сувязей адрозніваюць Д.в. з кумуляванымі (напр., ален $H_2C=C=CH_2$), спалучанымі (напр., бутадыен-1,3 $H_2\overset{1}{C}=\overset{2}{C}H—\overset{3}{C}H=\overset{4}{C}H_2$) і ізаляванымі (напр., пентадыен-1,4 $H_2\overset{1}{C}=\overset{2}{C}H—\overset{3}{C}H_2—\overset{4}{C}H=\overset{5}{C}H_2$) сувязямі.

Д. в. з кумуляванымі сувязямі складаюць клас аленаў, якія лёгка ўступаюць у рэакцыі далучэння (паслядоўна з кожнай з падвойных сувязей), полімерызуюцца, пры награванні і дзеянні каталізатара ізамерызуюцца ў спалучаныя Д.в. ці алкіны. Д. в. з ізаляванымі сувязямі па хім. уласцівасцях практычна не адрозніваюцца ад алкенаў. Спецыфічная ўласцівасць Д. в. са спалучанымі сувязямі — здольнасць уступаць у рэакцыі цыкладалучэння (гл. *Дыенавы сінтэз*) і хелетропныя рэакцыі. Пры ўзаемадзеянні спалучаных Д. в. з вадародам, галагенамі і галагенавадародамі далучэнне ідзе і па канцах сістэмы спалучаных сувязей і па адной з іх. Выкарыстоўваюць у прам-сці для вытв-сці сінт. каўчукоў (бутадыен, ізапрэн і інш.), поліамідных валокнаў, лакаў, фарбаў, інсектыцыдаў, лекаў і інш. Шкодна ўплываюць на ц.н.с., у газападобным выглядзе раздражняюць слізістыя абалонкі. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ДЫЁТА (ад грэч. diaita склад жыцця, рэжым харчавання), рацыён харчавання чалавека, які прадугледжвае пэўныя колькасныя і якасныя суадносіны харч. рэчываў і прадуктаў, спосабы кулінарнай апрацоўкі, інтэрвалы ў прыёме ежы. Распрацоўкай і рэкамендацыямі Д. для хворага займаецца дыеталогія. Д. складаецца з улікам фізіял. патрэбнасці арганізма ў харч. рэчывах і энергіі, хім. складзе і кулінарнай апрацоўкі ежы, характару паталаг. працэсу, яго стадыі, актыўнасці і функцыян. расстройстваў, тыповых для дадзенай хваробы; базіруецца на законах рацыянальнага харчавання — фізіялагічна паўнацэннага харчавання з улікам асаблівасцей чалавека.

Д. найчасцей назначаюць пры пэўнай хваробе (гастрыце, язвавай хваробе, інфаркце міякарда і інш.), пры хранічных хваробах страўнікава-кішачнага тракту, абмену рэчываў, сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэм, пры прафілактыкі, калі чалавек ачуньвае пасля хваробы, аперацыі. Пры хваробах унутр. органаў хворы павінен прытрымлівацца пэўнай Д. доўга, іншы раз усё жыццё. У лячэбна-прафілакт. установах адзіная нумарная сістэма Д. (ад № 1 да 15). Адрозніваюць таксама разгрузачныя Д. (1—2 дні ў тыдзень). Д. жывёл — рэжым кармлення хворай жывёлы. *М.Ф.Сарока.*

ДЫЕТАТЭРАПІ́Я, гл. *Лячэбнае харчаванне.*

ДЫЁД, прылада з аднабаковай праводнасцю эл. току. Бываюць электравакуумныя, іонныя і паўправадніковыя. Выкарыстоўваецца ў радыёэлектроніцы, энергетыцы для пераўтварэння (выпрамлення) пераменнага току ў пастаянны, для пераўтварэння ваганняў або частот, пераключэння эл. ланцугоў і інш.

Электравакуумныя і іонныя Д. маюць катод (крыніцу электронаў) і анод (прыёмнік электронаў). Пры дадатным напружанні на анодзе паміж электродамі праходзіць эл. ток, пры адмоўным — току няма. Асн. разнавіднасці сілавых Д.: *кенатрон* і *газатрон*. Работа *паўправадніковых дыёдаў* засн. на нелінейных уласцівасцях электронна-дзірачнага пераходу або кантакту метал—паўправаднік. Гл. таксама *Гана дыёд*, *Шоткі дыёд*.

ДЫЁНА, спадарожнік планеты *Сатурн*. Дыяметр 1120 км, сярэдняя адлегласць ад цэнтра планеты 377,4 тыс. км, маса 0,067 масы Зямлі. Сідэрычны перыяд абарачэння 2 сут 17 гадз 41 мін. Адкрыў Дж.Касіні (1684, Францыя).

1

2

3

4

5

6,7

8

Да арт. **Дызайн**. 1. Ю.Жуцяеў, С.Паланевіч, В.Сонца, С.Хлебародава. МАЗ-2000. 1994. 2. В.Сямёнаў. Цяжкавоз БелАЗ-7924. 1997. 3. Трактар «Беларусь». 4. Т.Кузюкова, А.Пастухоў, А.Цэхановіч. Мікраскоп. 1993. 5. Двухкамерны халадзільнік «Атлант». Мадэль 152-01. 6. А.Дольнікаў. Бінокль. 1997. 7. Г.Шакавец. Пыласос. 1995. 8. Т.Лісавенка. Калекцыя адзення «Мадыльяні». 1994.

1

3



4

Да арт. **Дызайн**. 1, 2. С.Саркісаў. Рэкламна-інфармацыйная графіка да 500-годдзя з дня нараджэння Ф.Скарыны. 1989. 3. Т.Гардашнікава, Дз.Сурскі. З серыі плакатаў «Эканомія ў быце». 1991. 4. Э.Жакевіч. Знакі-інфарматары да выдання У.А.Чантурыя «Гісторыя архітэктуры Беларусі». 1977.

2

ДЫЖО́Н (Dijon), горад на У Францыі. Адм. ц. дэпартамента Кот-д'Ор і гал. горад гіст. вобл. Бургундыя. Гар. правы з 1182. 151,6 тыс. ж., з прыгарадамі каля 250 тыс. ж. (1993). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на Бургундскім канале. Прам-сць: маш.-буд., хім., абутковая, харч., дрэваапрацоўчая. Цэнтр вытв-сці бургундскіх він. Ун-т (з 1722). Арх. помнікі: сабор Сен-Бенінь (10—14 ст.), цэрквы — раманская Сен-Філібер (12 ст.), гатычная Нотр-Дам (13 ст.), палац Бургундскіх герцагаў (14—18 ст., у ім Музей прыгожых мастацтваў), руіны манастыра Шанмоль (1383—88), рэнесансавая царква Сен-Мішэль (1499—1530) і інш.

ДЫЗ..., гл. *Дыс*...

ДЫЗА́ЙН (ад англ. design задума, праект, чарцёж, малюнак), від творчай дзейнасці па праектаванні і фарміраванні эстэт. і функцыян. якасцей прадметнага асяроддзя; вынік праектнай дзейнасці. Асн. аб'екты Д. — прадметна-прасторавае асяроддзе: яго кампаненты, рэчы і сувязі паміж імі, якія ўзяты ў адносінах да людзей і разглядаюцца ў разнастайных сістэмных сувязях з сацыякультурным асяроддзем. Мэта Д. — задавальненне матэрыяльных і духоўных патрабаванняў чалавека шляхам праектавання розных аб'ектаў: прамысл. вырабаў, элементаў візуальнай камунікацыі, адзення і інш.; фарміраванне гарманічнага прадметнага асяроддзя. Мае розныя галіны: Д. прамысловы, графічны, інтэр'ера і інш. З ім звязаны паняцці «тэхнічная эстэтыка» (тэорыя Д.) і «мастацкае канструяванне» (праектная практыка Д.).

Д. пачаў фарміравацца з развіццём масавай вытворчасці ў высокаразвітых прамысл. краінах (з 1754 Каралеўскае т-ва мастацтва ў Вялікабрытаніі пачало прысуджаць прэміі за лепшыя праекты прамысл. вырабаў). Развіццё Д. ў сучасным разуменні пачалося з 1-й пал. 20 ст. (нямецкі Веркбунд, 1907; *Баўгауз*, 1919—33; Вышэйшыя дзярж. маст.-тэхн. майстэрні ў Расіі, 1918—30). Важную ролю ў станаўленні Д. адыгралі Дж.*Рэскін*, У.*Морыс*, В.*Гропіус*, Л.*Міс ван дэр Роэ* і інш., якія прапагандавалі прынцыпы функцыяналізму, стварэнне тыповых, але старанна распрацаваных формаў. У 1959 на 1-й ген. асамблеі Міжнар. савета арг-цый прамысл. Д. прынята тэрмін industrial design (індустрыяльны дызайн; прафес. скарачэнне — дызайн).

У Беларусі Д. развіваецца з канца 1910. Гэтаму спрыяла дзейнасць аб'яд-

1

2

3

Да арт. **Дызайн**. 1. У.Цэслер, С.Войчанка. Лагатып фірмы. 1992. 2. Л.Мялоў, С.Саркісаў. Лагатып Целяханскай лыжнай фабрыкі. 1985. 3. Я.Круглоў. Лагатып транспартнай фірмы. 1988.

нання «*Сцвярджальнікі новага мастацтва*», створанага ў рамках Віцебскага маст.-практычнага ін-та па ініцыятыве К.*Малевіча* (існаваў да 1923). Новы ўздым Д. пачынаецца ў 1960-я г., асабліва ў вытв-сці трансп. сродкаў, быт. тэхнікі, мэблі, адзення і інш. У 1987 створаны *Саюз дызайнераў Беларусі*. Дызайнерская дзейнасць ажыццяўляецца ў *Нацыянальным дызайн-цэнтры*, дызайн-студыях Бел. саюза дызайнераў, на вытв. прадпрыемствах. З 1995 на Беларусі існуе Аддзяленне Міжнар. асацыяцыі «Саюз дызайнераў». Дызайнераў рыхтуюць Бел. АМ і Еўрапейскі гуманітарны ун-т.



Да арт. **Дызайн**. В.Мінько, А.Хількевіч. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі. Разварот кнігі. 1995.

Літ.: Безмоздин Л.Н. Художественно-конструктивная деятельность человека. Ташкент, 1975; Глазычев В.Л. О дизайне. М., 1970; Лазарев Е.Н. Дизайн машин. Л., 1988; Нестеренко О.И. Краткая энциклопедия дизайна. М., 1994; Селезнев И.Ф. Дизайн. Мн., 1978.

Ф.Р.Вількін, Я.Ю.Ленсу.

ДЫЗЕЛЕБУДАВА́ННЕ, гл. ў арт. *Энергетычнае машынабудаванне*.

Р.Дызель.

ДЫ́ЗЕЛЬ (Diesel) Рудольф Крысціян Карл (18.3.1858, Парыж — 29.9.1913), нямецкі інжынер і вынаходнік. Скончыў Вышэйшую політэхн. школу ў г. Мюнхен (1878). Прапанаваў ідэю стварэння рухавіка ўнутр. згарання з самазагараннем вадкага паліва ад сціскання (1892—93). У 1897 стварыў такі рухавік, пазней названы яго імем.

Літ.: Гумилевский Л.И. Рудольф Дизель. М.; Л., 1938.

ДЫ́ЗЕЛЬ, дызельны рухавік, рухавік унутранага згарання, у якім дызельнае паліва загараецца ад уздзеяння высокай т-ры паветра, сціснутага поршнем. Названы ў гонар Р.*Дызеля*. Адрозніваюць Д. двух- і чатырохтактавыя; з аб'ёмным і плёначным сумесеўтварэннем; паводле канструкцыі камеры згарання — з нераздзеленай камерай, перадкамерныя, віхракамерныя, паветракамерныя і інш.

У Д. з нераздзеленай камерай згарання паліва ўпырскваецца непасрэдна ў цыліндр, дзе раўнамерна распыляецца; у астатніх — сумесеўтварэнне залежыць ад завіхрэнняў паветра, якія ўзнікаюць з-за асаблівасцей канструкцыі. Удзельны расход паліва ў найб. дасканалых Д. да 190 г/(кВт·гадз); ккдз да 44%; ступень сціскання паветра да 20; магутнасць да 30 тыс. кВт, павышаюць яе наддувам. Д. выкарыстоўваюцца на транспарце, у энергетыцы (гл. напр., *Дызельная электрастанцыя*).

В.А.Сяргеенка.



Дызель: 1 — фарсунка; 2 — клапан; 3 — цыліндр з поршнем; 4 — паліўная помпа; 5 — каленчаты вал.

ДЫ́ЗЕЛЬ-МО́ЛАТ, агрэгат ударнага дзеяння для забівання паляў, які працуе па прынцыпе двухтактавага *дызеля*. Падвешваецца на *капры* або самаходныя капровыя ўстаноўкі. Ударная масіўная частка Д.-м. падае ўніз па накіравальных (штангі, труба, цыліндр), б'е па нагалоўніку палі і сціскае распыленае ў цыліндры або поршні дызельнае паліва, якое самаўзгараецца. Частка энергіі згарання перадаецца палі для апускання, частка падкідвае ўдарнае прыстасаванне Д.-м. ўверх (да 3 м). Маса ўдарных частак у двухштангавых Д.-м. да 2500 кг, у трубчастых да 500 кг.

ДЫ́ЗЕЛЬНАЕ ПА́ЛІВА, вадкае паліва з нафты для *дызеляў* і газатурбінных установак; сумесь вуглевадародаў, якая мае да 4% прымесей (азот-, сера- ці кіслародзмяшчальныя вытворныя вуглевадародаў). Атрымліваюць *дыстыляцыяй* нафты. У вытв-сці Д.п. для быстраходных дызеляў выкарыстоўваюць газнагазойлевыя фракцыі ($t_{кіп}$ 180—360 °С, шчыльн. 790—860 кг/м^3) з т-рай застывання ад -55 да -5 °С і загарання 35—61 °С, для ціхаходных — цяжкія вязкія фракцыі ($t_{кіп}$ 250—420 °С, шчыльн. 930 кг/м^3) з т-рай застывання ад -5 да 10 °С і загарання 65—85 °С. Эксплуатацыйныя ўласцівасці (хуткае загаранне і павольнае гарэнне) характарызуюцца *цэтанавым лікам* (аптымальнае значэнне яго для Д.п. 45—60).

ДЫ́ЗЕЛЬНАЯ ЭЛЕКТРАСТА́НЦЫЯ, цеплавая электрастанцыя, у якой *электрычны генератар* прыводзіцца ў дзеянне *дызелем*. Бываюць перасоўныя і стацыянарныя.

Перасоўныя Д.э. манціруюць на аўтамаб. прычэпах, чыг. платформах, абсталёўваюць быстраходнымі дызельнымі рухавікамі. Выкарыстоўваюць на буд-ве чыгунак, у лясной прам-сці, геолагаразведачных экспедыцыях і інш. На стацыянарных Д.э. устанаўліваюць 4- або (радзей) 2-тактавыя дызелі. Такія электрастанцыі будуюць у месцах, аддаленых ад ліній электраперадач, у раёнах з абмежаванымі крыніцамі водазабеспячэння. Выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы, на прамысл., буд. і трансп. прадпрыемствах у якасці асноўнай, рэзервовай і аварыйнай крыніцы электраэнергіі. Дызельэлектрычныя агрэгаты шырока ўжываюцца таксама для энергазабеспячэння войск, вайск. аб'ектаў і комплексаў ваен. тэхнікі. Д.э. высокаэканамічныя, надзейныя ў эксплуатацыі, аднак маюць адносна невял. мотарэсурс (працягласць эксплуатацыі да капітальнага рамонту).

ДЫ́ЗЕЛЬ-ПО́ЕЗД, чыгуначны састаў з маторнымі (абсталяваныя цягавымі рухавікамі — *дызелямі*) і прычапнымі вагонамі. Маторныя вагоны (2 ці болей) з кабінамі кіравання звычайна размяшчаюцца на канцах цягніка. Канструкцыйная скорасць Д.-п. да 120 км/гадз і больш. Выкарыстоўваюцца для прыгарадных і мясц. зносін на неэлектрыфікаваных чыгунках. Маторны вагон, які выкарыстоўваецца самастойна (без прычапных), наз. *аўтаматрысай*.

ДЫ́ЗЕЛЬ-ТРАЛЕЙВО́З, грузавая транспартная машына з электрарухавікамі, якія сілкуюцца ад кантактнага праводу, і *дызелем*, што выкарыстоўваецца на ўчастках, дзе пракладка кантактнага праводу немэтазгодна. Д.-т. прызначаны для перамяшчэння пародў у кар'ерах і для інш. мэт.

ДЫ́ЗЕЛЬ-ЭЛЕКТРАХО́Д, марское або рачное самаходнае судна, у якім электрагенератары, што сілкуюць грабныя электрарухавікі, прыводзяцца ў дзеянне *дызелямі*. Гл. таксама *Электраход*.

ДЫЗЕНТЭРЫ́ЙНАЯ АМЁБА, гл. ў арт. *Амёбы*.

ДЫЗЕНТЭРЫ́Я (ад *дыз...* + грэч. enteron кішка), к р ы в а ў к а, эпідэмічная хвароба з групы кішачных. Узбуджальнік Д. ў чалавека — дызентэрыйныя бактэрыі (самы пашыраны від Флекснера і Зоне). Крыніца інфекцыі — хворыя на Д. і бактэрыяносьбіты. Пашырэнню Д. спрыяюць мухі, парушэнне асабістай гігіены і сан. стану ўстаноў водазабеспячэння і харч. прадпрыемстваў. З харч. прадуктамі і вадой бактэрыі трапляюць у страўнікава-кішачны тракт і выклікаюць спецыфічнае запаленне язваў на слізістай абалонцы тоўстага кішэчніка.

Інкубацыйны перыяд 2—3, часцей 3—7 дзён. Вострая Д. пачынаецца з павышэння т-ры (37—38 °С), агульнай млявасці, дрэннага апетыту, схваткападобнага болю ў ніжняй ч. жывата, вадкага (з крывёю і сліззю) і частага (5—10 разоў у суткі) надворку. У апошні час амаль у 80% хворых Д. бывае са слабымі клінічнымі прыкметамі. Цяжкая форма вострай Д.: высокая ліхаманка, ці гіпатэрмія, часты (30—40 разоў у суткі) надворак і інш. — трапляецца рэдка. Хранічная Д. перыядычна абвастраецца. Лячэнне: шпіталізацыя, лячэбнае харчаванне, антыбіётыкі, аральная дэгідратацыя салявымі растворамі.

Сярод с.-г. жывёл на Д. хварэюць ягняты і парасяты. Заражэнне адбываецца праз корм, пітную ваду і подсціл, забруджаныя выдзяленнямі хворых жывёл і бактэрыяносьбітаў.

П.Л.Новікаў.

ДЫЗЛЕ́ПТЫКІ, гл. *Галюцынагены*.

ДЫЗРАЭ́ЛІ (Disraeli) Бенджамін (21.12.1804, Лондан — 19.4.1881), брытанскі паліт. і дзярж. дзеяч, пісьменнік.



Б.Дызраэлі.

Лорд Бікансфілд (з 1876). Сын пісьменніка І.Дызраэлі. У 1837—76 дэп. палаты абшчын ад партыі торы (з 1846 кіраўнік фракцыі). Міністр фінансаў у 1852, 1858—59, 1866—68; распрацаваў і ажыццявіў праект выбарчай рэформы (1867). Значная яго роля ў пераўтварэнні партыі торы ў *Кансерватыўную партыю Вялікабрытаніі* (з 1868 яе лідэр). Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі ў 1868 і 1874—80. Праводзіў актыўную знешнюю палітыку, накіраваную на пашырэнне тэр. і ўплыву Брыт. імперыі, у т.л. ў зоне Суэцкага канала (1875). Удзельнічаў у *Берлінскім кангрэсе 1878*. Аўтар раманаў і навел пра брыт. грамадства: «Вівіян Грэй» (1826—27), «Кантарыні Флемінг» (1832), «Сібіла, або Дзве нацыі» (1845), «Эндыміён» (1880) і інш.

Літ.: Т р у х а н о в с к и й В.Г. Бенджамин Дизраели // Вопр. истории. 1990. № 2.

Н.К.Мазоўка.

ДЫЗУРЫ́Я (ад *дыз...* + грэч. uron мача), парушэнне мочаспускання. Звычайна праяўляецца балючасцю ці цяжкасцю вывядзення мачы з мачавога пузыра з прычыны сціскання мочаспускальнага канала гематомай, пухлінай, павялічанай прастатай, пры закупорцы камянямі і інш., а таксама ў выніку функцыян. расстройстваў пры хваробах нерв. сістэмы (спазма і інш.). Іншы раз да Д. адносяць балючыя і частыя мочаспусканні.

ДЫКАРЫЁН (ад *ды...* + грэч. karyon арэх, ядро арэха), клетка грыба, якая мае збліжаныя, але не злучаныя паміж сабой гаплоідныя мужч. і жан. ядры. Узнікае пры палавым працэсе ў аскаміцэтаў (гл. *Сумчатыя грыбы*) і базідыяльных грыбоў.

ДЫ́КАС Томаш (25.9.1850, с. Гумніска каля г. Дэмбіца, Польшча — 19.4.1910), скульптар. Вучыўся ў Львове ў Э.Яскульскага. Скончыў школу прыгожых мастацтваў у Кракаве (1878) і Акадэмію прыгожых мастацтваў у Вене (1883). Працаваў у мармуры, гіпсе, дрэве. Атрымаў 2 першыя ўзнагароды ў конкурсе на помнік А.Міцкевічу ў Кракаве (1882 і 1885). Сярод работ: помнікі — А.Тызенгаўзу з партрэтным медальёнам для Гродзенскага б. езуіцкага касцёла (1886—87), А.Міцкевічу ў Пшэмыслі (Польшча, 1891), Цярнопалі (Украіна, 1895); надмагіллі А.Гілера ў Івана-Франкоўску (Украіна), Т.Левакоўскага і Крачыновічаў, рэльеф «Міласэрны самарыцянін» (1894), фігура Хрыста, які нясе крыж, для арм. царквы (усе ў Львове), скульптура «Цнатлівасць» (1883), партрэтныя медальёны В.Губульскага, Гілера і інш. *А.К.Лявонава.*

ДЫКЕА́РХ (грэч. Dikaiarchos; каля 347, г. Месена, цяпер г. Месіна, Італія — 278 да н.э.), старажытнагрэчаскі вучоны. Вучань Арыстоцеля і Тэафраста. Большую ч. жыцця правёў у Спарце, адкуль ажыццяўляў падарожжы з навук. мэтамі. Аўтар тв. «Жыццё Элады», у якім выкладаў гісторыю стварэння грэч. дзяржаў, іх дасягненні ў галіне л-ры, музыкі і інш. мастацтваў. Пісаў гісторыка-літ., біягр. і філас. творы, выступаў як аратар. У творы «Трыпалітыкон» крытычна падышоў да вучэння Платона аб дзяржаве. Стараж. крыніцы называюць Д. аўтарам твора «Апісанне Зямлі» і карты, на якой межы *айкумены* значна пашыраны ў параўнанні з картамі папярэдняй эпохі. На падставе ўласных вымярэнняў даволі дакладна для свайго часу вызначыў акружнасць Зямлі.

ДЫКЛІ́ТРА, кветкавая расліна, тое, што *дыцэнтра*.

ДЫКРА́НУМ (Dicranum), род брыевых імхоў сям. дыкранавых. Вядома больш за 50 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмераных і халоднай зонах Галарктыкі. Удзельнічаюць у фарміраванні наглебавага покрыва тундраў, балот і хвойных лясоў. На Беларусі 8 відаў. Найб. пашыраны ў хваёвых і мяшаных лясах Д. мётлападобны (D. scoparium) і Д. шматножкавы (D. polysetum).

Дыкранум шматножкавы: *а* — расліна, *б* — ліст.

Лістасцябловыя расліны. Дзярнінкі шчыльныя, бліскучыя, ад зялёных да бураватых. Сцябло простае або вілаватае, часта з рызоідным лямцам. Лісце звычайна павернута ў адзін бок, сэрцападобнае, радзей усебакова адтапыранае, суцэльнакрайняе ці зубчастае з жылкамі. Каробачка ад яйцападобнай да цыліндрычнай. Вечка з касой дзюбкай. Каўпачок буйны, клабукападобны.

ДЫКРАЦЭЛІЁЗ, гельмінтозная хвароба свойскіх і дзікіх жывёл (у т.л. буйн. раг. жывёлы), зрэдку чалавека, якая выклікаецца трэматодай Dicrocoelium lanceatum. Вельмі пашырана.

Развіццё ўзбуджальніка праходзіць з удзелам прамежкавага (наземныя малюскі) і дадатковага (многія віды мурашак) гаспадароў. Жывёлы заражаюцца, паядаючы разам з кармамі мурашак, інвазаваных лічынкамі глістоў.

У арганізме жвачных жывёл паразіты дасягаюць палавой спеласці праз 2,5—3 месяцы. Хвароба праяўляецца запаленнем жоўцевых хадоў печані і жоўцевага пузыра з агульным знясіленнем, адставаннем у росце і развіцці, зніжэннем прадукцыйнасці, пры значнай інвазіі жывёлы гінуць.

ДЫ́КСІЛЕНД (ад англ. Dixieland літар. краіна Дыксі — ужытковая назва паўд. штатаў ЗША), адна з стылявых разнавіднасцей класічнага *джаза*. Узнік у пач. 20 ст. ў Новым Арлеане сярод белых пасяленцаў ЗША. У 1910—20-я г. Д. — разнавіднасць новаарлеанскага стылю, з 1940-х г. (найб. пашыраны за межамі ЗША) — яго назва. З інструментаў у ім дамінуюць карнет, трамбон, кларнет. Сярод найб. вядомых калектываў у Расіі і Беларусі, якія выступаюць у стылі Д., — Ленінградскі дыксіленд, мінскі дыксіленд «Рэнесанс», дыксіленд пад кіраўніцтвам В.Старавойтава ў Магілёве.

ДЫКТА́ТАР (лац. dictator ад dicto дыктую, прадпісваю), 1) у лац. гарадах стараж. Італіі штогадова абраны правіцель, які меў неабмежаваную ўладу, у т.л. кіраўнік *Лацінскага саюза*. 2) У Стараж. Рыме перыяду Рэспублікі (5—2-я пал. 1 ст. да н.э.) надзвычайная службовая асоба (магістрат) з неабмежаванымі грамадскімі і вайск. паўнамоцтвамі, якая прызначалася консуламі паводле рашэння сената ў выключных выпадках (унутр. беспарадкі, ваен. небяспека) максімальна на 6 месяцаў. У 2—1 ст. да н.э. былі выпадкі бестэрміновай дыктатуры (Карнелій *Сула*, Юлій *Цэзар*). Пасада скасавана ў 44 да н.э. Маркам *Антоніем*. 3) Носьбіт дзярж. улады ў краінах з недэмакр. (аўтарытарным бо тоталітарным) праўленнем (гл. *Дыктатура*).

ДЫКТАТУ́РА, 1) сістэма неабмежаванага паліт., эканам., сац., духоўнага панавання на чале з лідэрам-дыктатарам. Яго імя або вызначаемая ім сац.-паліт. ідэя дае назву адпаведнай разнастайнасці дыктатарскага рэжыму (цэзарызм, *банапартызм*, *абсалютызм*, *фашызм*, *таталітарызм* і г.д.). Характарызуецца падаўленнем *грамадзянскай супольнасці*, паліт. тэрорам, канцэнтрацыяй улады ў руках дыктатара, усталяваннем юрыд. абмежаванняў паліт. правоў і свабод. Унутраная і знешняя палітыка ва ўмовах Д. грунтуецца на ідэалогіі *месіянізму*, прымусу непакорных. Паводле маркісцка-ленінскай тэорыі Д. — заканамерная з'ява класава-антаган. грамадства. Д. пралетарыяту ўстанаўліваецца ў выніку сацыяліст. рэвалюцыі і ахоплівае пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізму і мае на мэце буд-ва камунізму. Пры неабходных умовах яна выкарыстоўвае насілле для падаўлення супраціўлення эксплуататарскіх класаў і дзейнасці варожых сацыялізму элементаў. Ва ўмовах канчатковай перамогі сацыялізму Д. пралетарыяту завяршае сваю гіст. місію і ператвараецца ў агульнанародную дзяржаву пры захаванні кіруючай ролі камуніст. партыі да пабудовы камунізму. Д. — з'ява гіст., таму яе трэба разглядаць толькі ў канкрэтным гіст. кантэксце. Пры некаторых абставінах яна адыгрывала станоўчую ролю, захоўвала законнасць, парадак і тэр. цэласнасць краіны ў перыяд паліт. і сац.-эканам. крызісаў, а таксама адбіцця знешняй агрэсіі і прадухілення грамадз. вайны. Таму ў канстытуцыях некаторых краін (Францыя, Італія) прадугледжана магчымасць стварэння т.зв. «канстытуцыйнай Д.», якая мае магчымасць у надзвычайных сітуацыях ажыццяўляць экстраныя захады для аднаўлення законнасці і парадку ў краіне. 2) Спосаб ажыццяўлення дзярж. уладай непасрэднага выкарыстання ўзбр. насілля ў надзвычайных становішчах.

Літ.: Джилас М. Лицо тоталитаризма: [Пер. с серб.-хорв.]. М., 1992; Маркс К. Восемнадцатое брюмера Луи Бонапарта // Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2 изд. Т. 8; Ленін У.І. Дзяржава і рэвалюцыя // Тв. Т. 25. (Полн. собр. соч. Т. 33); Яго ж. Аб дыктатуры пралетарыяту // Тв. Т. 30. (Там жа. Т. 39).

Я.М.Бабосаў.

ДЫКТАФО́Н (ад лац. dicto дыктую, гавару + *...фон*), апарат для запісу і ўзнаўлення мовы, выкананы, напр., на аснове *магнітафона*. Бывае кабінетны і партатыўны (з сілкаваннем ад акумулятараў або эл. батарэй). Выкарыстоўваецца для дыктавання пісем, запісу выступленняў, лекцый і інш.

ДЫКТЫЯКАЎЛЁЗЫ, гельмінтозныя хваробы свойскіх і дзікіх траваедных жывёл, якія выклікаюцца нематодамі з роду Dictyocaulus. Вельмі пашыраны сярод авечак, коз і буйн. раг. жывёлы.

Развіццё гельмінта без удзелу прамежкавага гаспадара. Хварэе пераважна маладняк ва ўзросце да году. Жывёлы заражаюцца праз ваду і корм (пераважна ўлетку на пашы), інвазаваныя лічынкамі нематод. Першыя выпадкі захворвання адзначаюцца ў чэрв.—ліпені, максімальны пік інвазіі прыпадае на жнівень. Хвароба выяўляецца бранхітамі і запаленнем лёгкіх, анеміяй, знясіленнем.

ДЫКТЫЯКА́ЎЛЫ, род чарвей кл. нематод. 6 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі найб. распаўсюджаны і небяспечныя Д. ніткападобная (D. filaria) і Д. жывародная (D. viviparus), якія паразітуюць у бронхах і трахеях траваедных жывёл; выклікаюць *дыктыякаўлёзы*.

Цела (даўж. 12—150 мм) ніткападобнае, белаватае або жаўтавата-белае. Ротавая адтуліна абкружана 2 радамі сасочкаў і кутыкулярным кальцом, на дне ротавай поласці невял. зуб. Хвост у самкі завостраны, у самца з палавой рабрыстай бурсай і 2 спікуламі. Жывёлы заражаюцца інвазійнымі лічынкамі на пашы. Лічынкі трапляюць у кроў, потым у лёгачныя капіляры і ў дыхальныя шляхі. Палавой спеласці дасягаюць праз 21—60 дзён. Жывуць у арганізме жывёл 1,5 месяцы — 2 гады.



Дыктыякаўла жывародная: 1 — галаўны, 2 — хваставы канцы цела самкі.

ДЫ́КЦЫЯ (ад лац. dictio вымаўленне), вымаўленне, ступень выразнасці ў вымаўленні слоў і складоў пры дэкламацыі, спяванні. Добрая Д. (выразнае і дакладнае вымаўленне) мае асабліва важнае значэнне для акцёра, спевака, дыктара, настаўніка, лектара і інш.

Я.Дыла.

ДЫ́ЛА Язэп (Восіп Лявонавіч; псеўд. Назар Бываеўскі, Тодар Кулеша і інш.; 14.4.1880, г. Слуцк Мінскай вобл. — 7.4.1973), бел. пісьменнік і грамадскі дзеяч. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі (1890—98), Юр'еўскім вет. ін-це (г. Тарту, 1899—1903), адкуль выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. У 1903—04 у газ. «Северо-Западный край» (Мінск). У 1905 вёў нелегальную работу сярод бел. сялян. У 1906—18 працаваў у выдавецтвах Пецярбурга, Арэнбурга, Казані, Масквы. У студз.—лютым 1919 камісар працы ў Часовым рабоча-сял. сав. урадзе Беларусі. У 1921—24 на розных кіруючых пасадах у Мінску. З 1924 правадз. член і вучоны сакратар Інбелкульта, дырэктар Ін-та па вывучэнні мастацтва, дырэктар БДТ-1 (Нац. тэатр імя Я.Купалы), нам. загадчыка Белдзяржкіно. У 1930 рэпрэсіраваны. З 1931 жыў і працаваў у Саратаве. Рэабілітаваны ў 1957. Як пісьменнік дэбютаваў у «Нашай ніве» абразком «Перад раніцаю...» (нап. 1909), вершам «Вечар ясны, ціхі...» (1912). У 1918 змясціў у «Дзянніцы» шэраг публіцыст. артыкулаў. Аўтар драм. твораў «Пінскі гайдук» (паст. 1924, выд. 1926), «Падуанскі студэнт» (апубл. 1981, пра Ф.Скарыну, не закончаны), «Юнак з Крошына» (1965, пра П.Багрыма), рамана «На шляху з варагаў у грэкі» (не закончаны), гіст. аповесці («Настасся Мякота», 1968, пазнейшая назва «У імя дзяцей»), успамінаў пра А.Абуховіча, Я.Купалу, Я.Коласа, Я.Райніса, прац аб тэатр. жыцці Беларусі ў канцы 19 — пач. 20 ст. Пад псеўд. А.Дыла выдаў кн. для дзяцей «Храбры Юрка» (1934), «Белачка» (1935). Пераклаў на бел. мову вершы М.Канапніцкай, п'есы Я.Райніса «Гірт з воўчага логу», Э.Сінклера «Злодзей», Я.Яноўскага «Гнеў» і інш.

Тв.: Творы. Мн., 1981.

Літ.: Лаўшук С.С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пачатак 30-х гг.). Мн., 1984; Родчанка Р. Язэп Дыла // Беларусь. 1984. № 10. *А.В.Мальдзіс.*

ДЫЛАТАМЕ́ТРЫЯ (ад лац. dilato пашыраю + *...метрыя*), раздзел фізікі і вымяральнай тэхнікі, які вывучае залежнасць змен памераў цела ад уздзеяння знешніх умоў: т-ры, ціску, эл. і магн. палёў і інш. Прылады для мэт Д. наз. *дылатометрамі*; выкарыстоўваюць таксама метады *рэнтгенаўскага структурнага аналізу* для выяўлення змен параметраў крышталічнай рашоткі ўзору. Метады Д. выкарыстоўваюць у фізіцы, матэрыялазнаўстве і інш.

ДЫЛАТО́МЕТР, прылада, якая вымярае змены памераў цела, выкліканыя ўздзеяннем знешніх умоў (гл. *Дылатаметрыя*). Бывае оптыка-мех., ёмістасны, індукцыйны, інтэрферэнцыйны, рэнтгенаўскі, радыёрэзанансны і інш. Найб. важная характарыстыка — адчувальнасць да абс. змен памераў цела.

У оптыка-механічных Д. (адчувальнасць да 10^{-7} см) змены памераў даследаванага ўзору выклікаюць адпаведныя зрушэнні светлавога паказальніка; у ёмістасных Д. (адчувальнасць да 10^{-9} см) — змены ёмістасці калібраванага кандэнсатара; у індукцыйных Д. (адчувальнасць да 10^{-9} см) пры зменах памераў узору змяняецца ўзаемаіндуктыўнасць двух шпуль індуктыўнасці; у інтэрферэнцыйных Д. (адчувальнасць да 10^{-8} см) даследаваны ўзор размяшчаюць паміж аптычнымі пласцінамі і атрымліваюць інтэрферэнцыйную карціну пры асвятленні іх монахраматычным святлом (змены памераў выклікаюць зрушэнне інтэрферэнцыйных палос); у рэнтгенаўскіх Д. (адчувальнасць да 10^{-6} см) вымяраюць змену параметраў крышталічнай рашоткі цела на рэнтгенаграмах; у радыёрэзанансных Д. (адчувальнасць да 10^{-12} см) выяўляюцца змены рэзанаснай частаты аб'ёмнага рэзанатара, сценкі якога выраблены з даследаванага матэрыялу.



Дылатометры: *а* — вадкасны (1 — рэзервуар; 2 — калібраваны капіляр); *б* — кварцавы (1 — штурхач; 2 — трымальнік; 3 — узор; 4 — награвальнік або халадзільнік).

ДЫЛЕ́МА (ад *ды...* + *лема*), форма выводу, разнавіднасць *сілагізму*, пасылкамі (выходнымі дапушчэннямі) якога з'яўляюцца 2 гіпатэтычныя (умоўныя) і 1 дыз'юнктыўнае (раздзяляльнае) суджэнні. Адрозніваюць Д. канструктыўную (сцвярджальную) і дэструктыўную (адмоўную). Будова канструктыўнай Д. ў традыц. логіцы выражаецца формулай: «Калі А ёсць В, С ёсць Д. Калі Е ёсць F, С ёсць D. Але А ёсць В і Е ёсць F. Адсюдь С ёсць D». Будова скарочанай дэструктыўнай Д. выражаецца формулай: «Калі А ёсць В, С ёсць D. Калі Е ёсць F, С ёсць D. Але С не ёсць D. Значыць, А не ёсць В і Е не ёсць F». Усе гэтыя формы Д. даказальныя (або з'яўляюцца аксіёмамі) у сучаснай фаральнай (матэм.) логіцы, а дэструктыўная Д. часта выкарыстоўваецца ў лагічных абвяржэннях. Розныя віды сувязі суджэнняў, якія ўтвараюць паняцце Д., былі ўстаноўлены стараж.-грэч. філосафамі (гл. *Стаіцызм*), яны шырока выкарыстоўваліся ў схаластычнай логіцы. У пераносным сэнсе (у звычайнай свядомасці) пад Д. разумеюць стан, у якім апынаецца чалавек, калі яму неабходна зрабіць выбар паміж двума супрацьлеглымі роўна непрымальнымі для яго магчымасцямі (рашэннямі). *Т.І.Адула.*

ДЫ́ЛЕР (англ. dealer), пасрэднік, які выконвае гандл. аперацыі ад свайго імя і за свой кошт. У фін.-крэдытных адносінах дылерства азначае дзейнасць Д. па ажыццяўленні біржавых і пазабіржавых здзелак ад яго імя і за яго кошт.

ДЫЛЕТА́НЦТВА, дылетантызм (італьян. dilettante ад лац. delecto цешу, забаўляю), занятак, захапленне якой-н. навукай, мастацтвам ці інш. справай без дастатковай спец. падрыхтоўкі, пры павярхоўным знаёмстве з прадметам; аматарства.

ДЫЛЕ́ЦКІ Мікалай Паўлавіч (каля 1613, Кіеў — пасля 1680), украінскі муз. тэарэтык, кампазітар, педагог. Вучыўся ў Варшаве і Вільні, з канца 1670-х г. працаваў у Маскве. Аўтар трактата «Граматыка мусікійская», дзе найб. поўна выкладзены кампазіцыйныя асновы *партэсных спеваў*, вытлумачаны выразныя магчымасці музыкі ў духу тэорыі афектаў (гл. *Афектаў тэорыя*). Вядома некалькі рэдакцый гэтага трактата на розных мовах — польскай (1675, Вільня, не захаваўся), царк.-слав. (1677, Смаленск), рус. (1679, 1681, 1979, Масква; 1910, С.-Пецярбург), укр. (1723, Пецярбург; 1970, Кіеў). Гэта фундаментальная праца некалькі дзесяцігоддзяў была асноўнай пры вывучэнні тэорыі музыкі і кампазіцыі. Пад уплывам творчасці Д. склалася кампазітарская школа шматгалосых царк. спеваў. Яму належаць шматгалосыя хар. кампазіцыі.

ДЫ́ЛІНГ (англ. dealing), памяшканне, у якім супрацоўнікі банка або кампаніі (дылеры) ажыццяўляюць здзелкі з валютай, дэпазітамі, каштоўнымі паперамі, золатам з дапамогай тэлефонаў, тэлексаў, факсаў і інш. тэхнікі.

ДЫ́ЛІПУС (Delius) Фрэдэрык Тэадор Альберт (29.1.1862, г. Брадфард, Вялікабрытанія — 10.6.1934), англійскі кампазітар. З 1884 у ЗША, вывучаў негрыцянскі фальклор, у т.л. *спірычуэлы* (іх інтанацыі ўвасоблены ў многіх яго творах). З 1897 у Францыі. Майстар яркіх, незвычайных гармоній, адзін з першых англ. кампазітараў, якія звярталіся да нац. крыніц і вобразаў. Сярод твораў: оперы (6), у т.л. «Сельскія Рамэо і Джульета» (паст. 1907), «Ірмелін» (1953), «Фенімор і Герда» (1919); для салістаў, хору і аркестра — «Песні захаду сонца» (1907), Рэквіем (1916), «Песні развітання» (1930); для аркестра — «У летнім садзе» (1908), «Песня гор» (1911), «Песня лета» (1930); сюіты («Фларыда», 1887), рапсодыі і інш.; 4 канцэрты для інструментаў з аркестрам (1897—1921); 4 санаты для скрыпкі і фп. (1892—1930); для голасу з аркестрам — «Шакунтала» (1889) і інш.; камерна-вак. творы, хары, песні, музыка да драм. спектакляў.

ДЫЛО́ГІЯ (ад *ды...* + *...логія*), два самастойныя паводле будовы творы, звязаныя агульнасцю задумы, сюжэта, дзейных асоб. Найчасцей сустракаецца ў прозе (раманы А.Кулакоўскага «Расстаёмся ненадоўга» і «Сустрэчы на ростанях»; раманы А.Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой», аб'яднаныя пад агульнай назвай «Партызаны»), рэдка — у паэзіі (Д. «Грозная пушча» А.Куляшова складаецца з паэм «Стрэчны агонь» і «Грозная пушча») і драматургіі.

ДЫЛЬБАЗІ́ Мірварыд Паша кызы (н. 12.8.1912, в. Мусакей Казахскага р-на, Азербайджан), азербайджанская паэтэса. Нар. паэтэса Азербайджана (1973). Першы паэт. зб. «Наш голас» (1934) прысвяціла тэме разняволення жанчыны Усходу. У яе тэматычна-багатай спадчыне адлюстраваны подзвіг народа ў гады Вял. Айч. вайны (зб-кі «Любоў да радзімы», «Баявыя песні», «Камал Касымаў», усе 1942), барацьба за мір, самабытнасць і непаўторнасць роднага краю («Мясціны, дзе жывуць успаміны», 1964; «Горная кветка», 1977; «Каханне нараджаецца з намі», 1979, і інш.). Аўтар твораў для дзяцей. Выступае як перакладчык. На бел. мову вершы Д. перакладалі Э.Агняцвет, С.Панізнік.

Тв.: Бел. пер. — [Вершы] // Вышкі над морам. Мн., 1989.

ДЫМ, 1) акладная (падатковая) адзінка на Русі і ў Расіі (9—18 ст.), Македоніі (13—14 ст.), Польшчы, Закаўказзі (13—19 ст.). Складаўся з дома і двара аднаго ўладальніка; падатак («падымнае») звычайна браўся з колькасці печаў і дымаходаў у гаспадарцы (напр., у 16—18 ст. спец. падатак на карысць мясц. адміністрацыі ў Расіі). 2) Сялянская гаспадарка ў ВКЛ у 14—18 ст. Уяўляла сабой гасп. комплекс малой або вялікай (якая не падзялялася) сям'і, складалася з хаты, гасп. будынкаў, розных с.-г. угоддзяў, рабочай і прадукц. жывёлы, гасп. інвентару. Д. быў адным з асн. аб'ектаў пра-

ва ўласнасці феадалаў на зямлю, а таму і адным з асн. аб'ектаў уліку іх маёмасці. Разам са службай, *дварышчам*, жэрабем і валокай служыў таксама адной з асн. адзінак абкладання дзярж. падаткамі і феад. павіннасцямі.

ДЫМАНО́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, Дамаоўскае возера, у Віцебскім р-не, у бас. р. Лучоса, за 18 км на ПдУ ад г. Віцебск. Пл. 0,28 км², даўж. 1,3 км, найб. шыр. 280 м, даўж. берагавой лініі 2,7 км. Пл. вадазбору 2,57 км². Схілы катлавіны выш. 2—5 м (на ПнУ да 15 м) параслі лесам і хмызняком. Злучана ручаём з Доўгім возерам.

ДЫМАРФІ́ЗМ (ад *ды...* + грэч. morphḗ форма), наяўнасць у асобін аднаго віду жывёл ці раслін адной мясцовасці 2 формаў, якія адрозніваюцца морфафізіялагічнымі прыкметамі; разнавіднасць *полімарфізму*.

Да арт. **Дымарфізм**: жук-алень (1 — самка; 2 — самец).

У жывёл найчасцей адзначаецца палавы Д., пры якім самцы і самкі адрозніваюцца паміж сабой памерамі, формай, афарбоўкай, паводзінамі (напр., адсутнасць рагоў у самак і наяўнасць іх у самцоў). Сезонны Д. абумоўлены зменамі тэмператур, пры якіх існуе арганізм (напр., бурая летняя і белая зімовая афарбоўка футра ў зайца-беляка). Можа праяўляцца і як прыватны выпадак чаргавання пакаленняў (у паразітычных чарвей, некат. насякомых). У раслін адрозніваюць Д., што праяўляецца ва ўсім вонкавым выглядзе або ў будове асобных органаў. Сезонны Д. у раслін — наяўнасць веснавой і асенняй формаў (напр., у братаўкі).

ДЫМАЎТВАРА́ЛЬНЫЯ РЭ́ЧЫВЫ, рэчывы, якія ў атмасферы даюць устойлівыя *аэразолі*; прызначаны для стварэння маскіруючых дымавых заслон. Да Д.р. адносяцца белы *фосфар*, цвёрдыя піратэхн. і вадкія сумесі, што пры гарэнні (т-ра 400—1000 °С) утвараюць дым ці туман рознымі метадамі.

Белы фосфар утварае дым пры ўзаемадзеянні з кіслародам паветра. Вадкія Д.р. — *хлорсульфонавая кіслата*, хларыды тытану $TiCl_4$, волава $SnCl_4$ і інш. ўтвараюць туман з кропель вадкасці, якая ўзаемадзейнічае з вільгаццю паветра; саставы на аснове нафтапрадуктаў (*дызельнае паліва*, *мазут*) даюць дым пры выпарэнні і наступнай кандэнсацыі пары. Піратэхн. сумесі маюць цвёрдыя Д.р., якія лёгка сублімуюць пры высокай т-ры (хларыд амонію, *нафталін*, *антрацэн*). Выкарыстоўваюць у вайск. справе (дымавыя шашкі, гранаты) і сельскай гаспадарцы (напр., для аховы раслін ад замаразкаў).

Р.А.Чарнушэвіч.

ДЫМЕТЫЛАМІ́Н, другасны *амін* аліфатычнага рада, $(CH_3)_2NH$. Бясколерны газ з рэзкім непрыемным пахам, $t_{кіп}$ 6,9 °С, шчыльн. 654 кг/м³ (20 °С). Растваральнікі. Атрымліваюць узаемадзеяннем метанолу ці дыметылавага эфіру з аміякам. Выкарыстоўваюць у вытв-сці паскаральнікаў вулканізацыі, лекаў, гербіцыдаў, мыйных сродкаў і інш. Таксічны, ГДК 1 мг/м³ (у паветры), 0,1 мг/л (у вадзе).

ДЫМЕТЫЛАНІЛІ́Н, N,N-дыметыламінабензол, трацічны *амін*, $C_6H_5N(CH_3)_2$. Жоўтая вадкасць з дзягцярным пахам, $t_{пл}$ 2,5 °С, $t_{кіп}$ 194,15 °С, шчыльн. 955,7 кг/м³ (20 °С). Дрэнна растваральнікі. Атрымліваюць награваннем аніліну і метанолу пад ціскам у прысутнасці сернай к-ты. Выкарыстоўваюць у вытв-сці фарбавальнікаў, выбуховых рэчываў, як праявіцель для каляровай фатаграфіі. Выклікае ўтварэнне язваў на скуры, ператварэнне гемаглабіну ў метгемаглабін, ГДК 0,2 мг/м³.

ДЫМЕТЫЛБЕНЗО́ЛЫ, гл. *Ксілолы*.

ДЫМЕТЫЛГІДРАЗІ́Н, арганічнае злучэнне, вытворнае *гідразіну*, $C_2H_8N_2$. Вядомыя 2 ізамеры: Д. сіметрычны $CH_3NH—NHCH_3$ і Д. несіметрычны $(CH_3)_2N—NH_2$. Практычнае значэнне мае *несім*-Д., бясколерная вадкасць, $t_{кіп}$ 62,8—63,8 °С, шчыльн. 791,1 кг/м³ (20 °С). Вельмі гіграскапічны, растваральнікі. Моцная аснова, утварае ўстойлівыя солі з кіслотамі. Выкарыстоўваюць як гаручае ракетнага паліва (многатанажны прадукт). Раздражняе скуру, слізістыя абалонкі вачэй і дыхальных шляхоў, ГДК 1 мг/м³.

ДЫМЕТЫЛСУЛЬФАКСІ́Д (ДМСА), аліфатычны сульфаксід, $(CH_3)_2S=O$. Гіграскапічная вадкасць без колеру і паху, $t_{пл}$ 18,45 °С, $t_{кіп}$ 189 °С (кіпіць з раскладаннем), шчыльн. 1096 кг/м³ (25 °С). Растваральнікі. Выкарыстоўваюць як растваральнік у вытв-сці сінт. валокнаў, пестыцыдаў, як кампанент касметычных і лек. сродкаў (садзейнічае пранікненню праз скуру розных рэчываў), сумесі з вадой як антыфрызы і гідраўл. вадкасці.

ДЫМЕТЫЛФОРМАМІ́Д (ДМФА), N,N-дызамешчаны амід мурашынай к-ты, $HCON(CH_3)_2$. Бясколерная гіграскапічная вадкасць, $t_{кіп}$ 153 °С, шчыльн. 944,5 кг/м³ (25 °С). Змешваецца з вадой і з большасцю арган. растваральнікаў, за выключэннем алканаў. Слабая аснова, утварае няўстойлівыя солі з моцнымі мінер. к-тамі, гідралізуецца ў прысутнасці к-т і асноў. Выкарыстоўваюць як растваральнік у вытв-сці сінт. валокнаў, лакафарбавых матэрыялаў, штучнай скуры, поліамідаў, для вывучэння ацэтыленавых і дыенавых вуглевадародаў з газаў піролізу, для экстракцыі арэнаў. Раздражняе слізістыя абалонкі вачэй, ГДК 10 мг/м³. Гл. таксама *Аміды кіслот*.

ДЫМІТРЫЯ́ДЗІ Адысей Ахілесавіч (н. 7.7.1908, г. Батумі, Аджарыя), грузінскі дырыжор. Нар. арт. СССР (1958). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1936, клас І.*Мусіна*). У 1937—74 (з перапынкамі) дырыжор, у 1952—65 гал. дырыжор Груз. т-ра оперы і балета. У 1965—73 у Вял. т-ры. У 1947—52 гал. дырыжор Дзярж. сімф. аркестра Грузіі. Выкладаў у Тбіліскай (1937—41 і з 1957, праф. з 1961) і Маскоўскай (1968—73) кансерваторыях. Першы выканаўца шматлікіх твораў сав. кампазітараў. Пад яго муз. кіраўніцтвам пастаўлены многія оперы і балеты. Дзярж. прэмія Грузіі 1989.

ДЫ́МКАЎСКАЯ ЦА́ЦКА, вяцкая, кіраўская цацка, рускі нар. маст. промысел у слабадзе Дымкава (цяпер у межах г. Кірава, Расія). Існуе здаўна (у літаратуры згадваецца з 1811). Д.ц. лепяць з гліны, абпальваюць і па грунце размалёўваюць тэмперай, аздабляюць сусальным золатам; характэрны

Да арт. **Дымкаўская цацка**. З.Пенкіна. Руская зіма. 1961.



Дымнік на даху царквы ў вёсцы Ялова Пружанскага раёна Брэсцкай вобл.

абагульненасць і гратэскавасць формаў. Матывы і старадаўнія, і новыя («барыня», «няньки», казачныя сюжэты, сцэны побыту, анімалістычныя выявы). Яркая дэкаратыўная размалёўка ўключае геам. арнамент і мае імправізаваны характар. У 1919 створана майстэрня (з 1942 — цэх т-ва «Кіраўскі мастак», з 1956 — цэх у складзе Маст.-вытв. майстэрняў Кіраўскага аддзялення Маст. фонду Расіі).

ДЫ́МНІК, 1) адтуліна ў столі курной хаты для выхаду дыму. Часам меў дымаход (драўляны або сплецены з лазы атынкаваны комін), завершаны 2-схільнай стрэшкай, афармлены ярусными карнізамі і інш. элементамі аздобы. 2) Невял. франтончык, звычайна трохвугольны, у завяршэнні тарцовага схілу вальмавага даху. Першапачатковае функцыянальнае прызначэнне для выхаду дыму ад курной печы. Пашыраны пераважна на З і ПдЗ Беларусі ў жылых, культавых, гасп. будынках. Паступова ператварыўся ў дэкар. элемент даху, часам аздабляўся вільчыкамі, разьбой, у культавых збудаваннях — аб'ёмнай скульптурай.

ДЫ́МНІЦА (Fumaria), род кветкавых раслін сям. дымніцавых. Каля 50 відаў. Пашыраны пераважна ў Міжземнамор'і. На Беларусі 3 віды: Д. лекавая (F. officinalis), трапляецца ўсюды як пустазелле; Ваяна (F. vaillantii), вельмі рэдкі від, расце на мелавых агаленнях; казіная (F. capreolata), трапляецца зрэдку як здзічэлая.

Аднагадовыя травяністыя расліны з тонкім разгалінаваным прамастойным сцяблом і стрыжнёвым коранем. Лісце чаргаванае, тонкае, перыстарассечанае, шызае, нібы дымчатае (адсюль назва), або зялёнае. Кветкі дробныя, фіялетава-ружовыя, радзей белыя, з кароткімі шпорцамі, сабраныя ў гронкі. Плод арэшкападобны. Лек. (мачагонны, жаўцягонны, патагонны, узбуджаны і танізоўны сродак) і фарбавальныя расліны. Ядавітыя (маюць фумаравую к-ту, алкалоід фумарын).

Дымніца лекавая.

ДЫ́МНЫ ПО́РАХ, чорны порах, зярнёная механічная сумесь каліевай салетры (75%), драўнянага вуталю (15%) і серы (10% па масе). Лёгка загараецца і хутка згарае (цеплата згарання 32,3 МДж/кг) без доступу паветра з утварэннем газаў, здольных выконваць значную мех. работу. У Кітаі вядомы з 10—11 ст., у Еўропе — з 13 ст. Да сярэдзіны 19 ст. заставаўся адзіным *брызантным выбуховым рэчывам*. Выкарыстоўваюць пры здабычы штучнага каменю, для вырабу вогнеправоднага шнура. Гл. таксама *Порах*.

ДЫНАЗА́ЎРЫ (Dinosauria), самая шматлікая група вымерлых паўзуноў падкл. *архазаўраў*. 2 атр.: Д. яшчаратазавыя (Saurischia) і Д. птушкатазавыя (Ornithischia). Больш за 600 відаў. Паходзілі ад трыясавых архазаўраў — тэкадонтаў, вядомы з трыясу да мелу на ўсіх мацерыках (акрамя Антарктыды). Росквіт у юрскім перыядзе. Паявіліся на Зямлі каля 225 млн., вымерлі каля 65 млн. гадоў назад.

Даўж. цела ад 20—60 см (кампсагнаты) да 30 м, маса ад 3 кг да 136 т (ультразаўр). Галава адносна малая, поласць чэрапа зусім маленькая. Тазавы пояс у Д. яшчаратазавых 3-прамянёвы, у птушкатазавых 4-прамянёвы. Першыя з Д. яшчаратазавых (тэраподы) хадзілі на 2 нагах, пярэднімі канечнасцямі захоплівалі здабычу. Д. яшчаратазавыя — драпежнікі, ад іх паходзілі расліннаедныя (заўраподы); буйныя, хадзілі на 4 нагах (апатазаўры, брахіязаўры, *дыпладокі*). Д. птушкатазавыя спачатку ўстойліва трымаліся і хадзілі на 2 нагах (арнітаподы), потым на 4. Некат. з іх мелі шыпы і пласціны на спіне і хвасце (*стэгазаўры*) ці панцыр і рогі на галаве (цэратапсы), цела было ўкрыта панцырам (*анкілазаўры*). Адкладвалі яйцы. Кіроўныя выкапнёвыя (з дапамогай іх рэшткаў вызна-

Дыназаўры. Яшчаратазавыя: 1 — тыраназаўр; 2 — брахіязаўр; 3 — платэазаўр. Птушкатазавыя: 4 — кентруразаўр; 5 — трыцэратопс; 6 — качканосы.

чаюць геал. ўзрост кантынентальных адкладаў). *П.Ф.Калiноўскі.*

ДЫНАМА... (ад грэч. dynamis сіла), першая састаўная частка складаных слоў, якая паказвае на дачыненне да сілы, энергіі, напр., *дынамаметамарфізм, дынамометр.*

«ДЫНА́МА», беларускае фізкультурна-спарт. т-ва. Аб'ядноўвае супрацоўнікаў і ваеннаслужачых Мін-ва ўнутр. спраў, Камітэта дзярж. бяспекі, мытні, пагран., унутр. войск, навуч. устаноў. Арганізавана ў 1923. Культывуецца 20 алімп. відаў спорту. Мае калектывы «Юны дынамавец», «Юны сябра міліцыі», «Юны сябра пажарных», падлеткавыя клубы. Падрыхтаваны 61 засл. майстар спорту, 280 майстроў спорту міжнар. класа, 2312 майстроў спорту. Выхаванцы «Д.» заваявалі 57 алімп. медалёў, з іх 22 залатыя, і 891 медаль на Кубках, чэмпіянатах, першынствах свету і Еўропы. Найб. вядомыя выхаванцы: Т.Самусенка, А.Бялова, А.Раманькоў (фехтаванне), У.Парфяновіч, В.Рэнейскі, У.Раманоўскі, А.Масяйкоў (веславанне), Л.Петрык (спарт. гімнастыка), М.Лобач (маст. гімнастыка), В.Яноўскі (бокс), І.Шылава, К.Лукашык (кулявая стральба), А.Партноў (скачкі ў ваду), А.Папоў (біятлон) і інш. Званне «Заслужаны трэнер» маюць 246 чал. Спарт. базы: стадыён «Дынама», комплекс з лёгкаатлетычным манежам, спецыялізаваныя спартзалы і аднаўленчыя цэнры ў Мінску, Гомелі, Брэсце, базы ў Стайках і Раўбічах. *Дз.А.Ашмянскі.*

«ДЫНА́МА», стадыён у Мінску. Адкрыты ў 1934, рэканструяваны ў 1939. Асн. збудаванні ў час Вял. Айч. вайны разбураны. Новы стадыён пабудаваны ў 1947—54 (арх. М.Колі, М.Паруснікаў і інш.). Рэканструяваны ў 1978—80 (арх. С.Баткоўскі, М.Гаўхфельд, Л.Гельфанд, Ю.Спясіўцаў) да Алімпійскіх гульняў 1980 для папярэдніх спаборніцтваў па футболе. На трыбунах больш за 50 тыс. месцаў. Каля аднаго з уваходаў на тэр. стадыёна размешчана дэкар. скульптура «Бег» (1980, скульптар В.Занковіч).

ДЫНАМАМЕТАМАРФІ́ЗМ (ад *дынама...* + *метамарфізм*), структурнае, а таксама мінералагічнае пераўтварэнне горных парод пад уздзеяннем тэктанічных рухаў. Пашыраны пры складкаўтварэнні і лакалізаваны ў зонах разрыўных тэктанічных парушэнняў (скід, разлом, насоў). Адбываецца з мех. раздрабленнем і сціраннем пародаўтваральных мінералаў, пры адсутнасці перакрышталізацыі. Такі Д. характэрны для верхніх узроўняў зямной кары з адносна нізкімі т-рамі. Прадуктамі яго з'яўляюцца катаклазіты, міланіты і розныя сланцы. Для сярэдніх і глыбокіх узроўняў зямной кары тэктанагенныя разбурэнні парод адбываюцца з перакрышталізацыяй і ўтварэннем новых мінералаў. Прадуктамі гэтых працэсаў з'яўляюцца тэктаніты.

ДЫНА́МІК, пашыраная кароткая назва электрадынамічнага *гучнагаварыцеля.*

ДЫНА́МІКА (ад грэч. dynamikos моцны), раздзел *механікі*, які вывучае рух матэрыяльных цел пад дзеяннем прыкладзеных да іх сіл. Грунтуецца на 3 асн. законах (гл. *Ньютана законы механікі*). У Д. рашаюцца задачы 2 тыпаў: вызначэнне сіл, што дзейнічаюць на цела (ці мех. сістэму) па вядомым законе руху, і вызначэнне закону руху па вядомых сілах (асн. тып задач). У выніку вывучэння руху асобных аб'ектаў метадамі Д. ўзнік шэраг спец. дысцыплін — балістыка, нябесная механіка, дынаміка збудаванняў, дынаміка механізмаў і машын і інш.

Задачы Д. рашаюцца з дапамогай дыферэнцыяльных ураўненняў руху, якія паказваюць залежнасць паміж сіламі, што дзейнічаюць на сістэму, масай сістэмы і параметрамі, што вызначаюць яе становішча ў прасторы. Для руху матэрыяльнага пункта і вярчальнага руху цвёрдага цела гэта ўраўненні тыпу 2-га закону Ньютана. Для дэфармаваных цел, вадкасцей і газаў ураўненні руху — дыферэнцыяльныя ўраўненні ў частковых вытворных. Да іх далучаюцца ўраўненні, якія характарызуюць некат. ўласцівасці асяроддзя (напр., залежнасць шчыльнасці ад ціску ці мех. напружанняў, дэфармацыі і інш.). Каб знайсці закон руху мех. сістэмы, трэба ведаць сілы і т. зв. пачатковыя ўмовы, г. зн. каардынаты і скорасці пунктаў сістэмы ў пачатковы момант часу. Для дэфармаваных цел, вадкасцей і газаў трэба дадаць і гранічныя ўмовы (гл. *Краявая задача*). Дыферэнцыяльныя ўраўненні руху мех. сістэмы можна атрымаць і з *варыяцыйных прынцыпаў механікі.* *А.І.Болсун.*

ДЫНА́МІКА ў м у з ы ц ы, адзін з бакоў арганізацыі музыкі як працэсу; характарызуецца зменамі гучнасці, шчыльнасці гучання і тэмпу. У больш шырокім сэнсе — любыя змены ў муз. развіцці, а таксама іх адлюстраванне ва ўспрыняцці. Вызначаецца дзеяннем розных якасцей муз. гуку (вышыня, сіла, працягласць, тэмбр), інтэнсіўнасцю і частатой змен розных параметраў. Выяўляецца ў мелодыі, гармоніі, рытміцы, тэмпе, фактуры і інш., на розных узроўнях муз. развіцця (напр., у асобным гуку, у матыве, фразе, частцы, цыкле). Найб. дэталёва Д. ў музыказнаўстве разглядаюць як сукупнасць з'яў, звязаных з гучнасцю, і як вучэнне пра гэтыя з'явы. У такім значэнні тэрмін вядомы з 19 ст. Гістарычна распрацавана дакладная сістэма абазначэння дынамічных адценняў (выкарыстоўваюць італьян. тэрміны).

Асн. абазначэнні: forte-fortissimo (fff) — надзвычай гучна, fortissimo (ff) — вельмі гучна, forte (f) — гучна, mezzo forte (mf) — умерана гучна, mezzo piano (mp) — умерана ціха, piano (p) — ціха, pianissimo (pp) — вельмі ціха, piano-pianissimo (ppp) — надзвычай ціха; crescendo (графічнае <) — паступовае ўзмацненне гуку, diminuendo або decrescendo (>) — паступовае аслабленне гуку; раптоўная змена дынамічнага адценняў — subito. Д. ўключае таксама *акцэнты.* Гучнасная Д. мае непасрэдныя адносіны да *інтэрпрэтацыі* (указанні кампазітара хоць і абавязковыя для выканаўцы, але дазваляюць індывід. трактоўку). Д. — важны сродак муз. выразнасці. Побач з *агогікай*, *артыкуляцыяй*, фразіроўкай яна адыгрывае вял. ролю ў муз.-выканальніцкім мастацтве.

ДЫНА́МІКА ЗБУДАВА́ННЯЎ, раздзел *будаўнічай механікі*, які вывучае ваганні збудаванняў, што выклікаюцца дынамічнымі нагрузкамі, распрацоўвае метады разліку такіх збудаванняў, спосабы вібраізаляцыі і гашэння ваганняў. Звязаны са *статыкай збудаванняў* і агульнай тэорыяй ваганняў.

У Д.з. даследуюць ветравыя і сейсмічныя ваганні, ударнае ўздзеянне рухомых цел, вібрацыю і інш. нагрузкі, уздзеянне ваганняў на абсталяванне і людзей, вызначаюць мяжу трываласці і інш. дынамічныя характарыстыкі матэрыялаў і канструкцый, правяраюць надзейнасць разліковых схем збудаванняў і інш.

Стадыён «Дынама» ў Мінску

Асн. задачы Д.з. — вызначэнне ўласных частот і праверка збудаванняў на рэзананс; вызначэнне ўнутр. сіл у элементах збудаванняў, перамяшчэнняў, скорасцей і паскарэнняў мас збудаванняў, якія выкліканы дынамічнымі нагрузкамі і ўздзеяннямі. Для рашэння гэтых задач карыстаюцца тэарэт. метадамі даследавання (аналітычныя і лікавыя, з выкарыстаннем выліч. тэхнікі) і эксперыментальнымі (засн. на даследаванні фіз. мадэлей збудаванняў, на натуральных выпрабаваннях і назіраннях).

Літ.: Строительная механика. Динамика и устойчивость сооружений. М., 1984.

Я.М.Сідаровіч.

ДЫНА́МІКА МЕХАНІ́ЗМАЎ І МАШЫ́Н, раздзел *механізмаў і машын тэорыі*, у якім вывучаецца рух механізмаў і машын з улікам сіл, што ўздзейнічаюць на іх. Асн. задача Д.м. і м. — вызначэнне руху звёнаў па зададзеных сілах і вызначэнне сіл па зададзеным руху звёнаў.

Для вызначэння руху звёнаў складаюць ураўненне руху. Для механізмаў з некалькімі ступенямі свабоды (напр., маніпулятараў) пры галаномных сувязях ураўненні руху складаюць звычайна ў форме дыферэнцыяльных ураўненняў Лагранжа 2-га роду. Для мех. сістэм з адной ступенню свабоды (да іх адносіцца большасць тэхнал. машын) эфектыўны метад прывядзення сіл і мас, які дазваляе звесці задачу аб руху сістэмы звёнаў да эквівалентнай у дынамічных адносінах задачы аб руху аднаго звяна (пункта) прывядзення. Атрыманыя ўраўненні руху звычайна нелінейныя і інтэгруюцца толькі прыбліжана лікавымі метадамі з дапамогай ЭВМ. Сілавы разлік механізмаў мае на мэце вызначэнне рэакцый у кінематычных парах, якія выкарыстоўваюцца для разліку звёнаў на трываласць і падбору падшыпнікаў. Пры гэтым у разлік уводзяцца сілы інерцыі (метад кінетастатыкі). У Д.м. і м. разглядаюцца таксама задачы рэгулявання скорасці пры розных рэжымах руху, памяншэння і дынамічных нагрузак на звёны ўраўнаважваннем мас і сіл, аховы машын ад вібрацый, вызначэння мех. ккдз і інш. Пры рашэнні задач дынамікі важны рацыянальны выбар разліковых дынамічных мадэлей. Сучасная Д.м. і м. аддае ўвагу праблемам узаемадзеяння мех. частак машын з рухавіком і сістэмай кіравання, пабудове сістэм праграмнага кіравання, забеспячэння ўмоў дынамічнай устойлівасці.

Літ.: Динамика машин и управление машинами: Справ. М., 1988; Коловский М.З. Динамика машин. Л., 1989. *В.К.Акуліч.*

ДЫНА́МІКА ПАДЗЕ́МНЫХ ВОД, галіна *гідрагеалогіі*, якая вывучае рэжым і баланс падземных вод. Грунтуецца на тэорыі фільтрацыі і звязана з гідраўлікай і гідрамеханікай. Засн. ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. франц. вучонымі А.Дарсі і Ж.Дзюпюі (выявілі лінейны закон фільтрацыі), рус. вучоным М.Я.Жукоўскім (распрацаваў тэорыю руху падземных вод) і інш. Метады Д.п.в. выкарыстоўваюцца пры рашэнні задач гідратэхн. буд-ва, вызначэнні руху падземных вод па неаднародных пластах, падпору грунтавых вод, рэгіянальнай дынамікі глыбокіх і ўзаемадзейных ваданосных гарызонтаў, нафта- і газагідрадынамікі, ацэнкі эксплуатацыйных запасаў падземных вод і інш.

ДЫНАМІ́ТЫ (франц. dynamite ад грэч. dynamis сіла), сумесевыя *брызантныя выбуховыя рэчывы*, якія маюць больш за 15% *нітрагліцэрыны*. Іх шчыльнасць, пластычнасць, устойлівасць да ўздзеяння вады, таксама адчувальнасць да мех. уздзеянняў (трэнне, удары) узрастаюць з павелічэннем колькасці нітрагліцэрыны ў сумесі.

Адрозніваюць гурдынаміты (вынайдзены А.*Нобелем*, 1867), у якіх нітрагліцэрына змяшана з інертным парашкападобным напаўняльнікам (напр., кізельгурам, талькам), і больш устойлівыя жэлацінданаміты, дзе нітрагліцэрына жэлацінавана калаксілінам (гл. *Нітраты цэлюлозы*), напр., грымучы студзень (раствор 7—8% калаксіліну ў нітрагліцэрыне) — найб. магутны жэлаціндынаміт. З канца 19 ст. выкарыстоўвалі для многіх відаў узрыўных работ. Зараз карыстаюцца больш бяспечнымі выбуховымі рэчывамі (напр., *аманіты*, *дынамоны* і інш.).

Літ.: Дубнов Л.В., Бахаревич Н.С., Романов А.И. Промышленные взрывчатые вещества. 3 изд. М., 1988.

ДЫНАМІ́ЧНАЕ ПРАГРАМАВА́ННЕ, раздзел матэматыкі, прысвечаны тэорыі і метадам рашэння многакрокавых задач *аптымальнага кіравання*. Грунтуецца на прынцыпе аптымальнасці, прапанаваным у 1950-я г. амер. матэматыкам Р.Белманам. У матэм. тэорыі кіроўных працэсаў строгае абгрунтаванне атрымана Л.С.Пантрагіным і інш. Выкарыстоўваецца ў *аперацыі даследаванні*, у задачах аптымальнага планавання (напр., аб аптымальнасці размеркавання рэсурсаў, замены абсталявання), пры рашэнні многіх тэхн. праблем (у задачах кіравання паслядоўнымі хім. працэсамі, аптымальнага праектавання пракладкі дарог, аптымальных памераў ступеней ракет).

У Д.п. для кіроўных працэсаў сярод магчымых кіраванняў выбіраецца тое, якое вядзе да экстрэмальнага значэння мэтавай функцыі. Многакрокавасць вынікае з рэальнага працякання працэсаў або ўводзіцца штучна для расчлянення зыходнага працэсу прыняцця рашэння (у т.л. неперарыўнага) на асобныя этапы (крокі), якія выконваюцца ў розныя моманты часу. Гал. асаблівасць Д.п. — магчымасць рашаць усе аднатыпныя задачы пры любых пачатковых умовах (напр., вызначэнне аптымальнага рэжыму палёту самалёта ў зменлівых умовах надвор'я). На Беларусі праблемы Д.п. распрацоўваюцца ў Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН, БДУ, Бел. дзярж. эканам. ун-це.

Літ.: Беллман Р. Динамическое программирование: Пер. с англ. М., 1960; Хедли Дж. Нелинейное и динамическое программирование: Пер. с англ. М., 1967.

С.У.Абламейка.

ДЫНАМІ́ЧНАЯ ГАЛАГРА́ФІЯ, галіна *галаграфіі*, у якой разглядаюцца заканамернасці пераўтварэння і апрацоўкі хвалевых палёў на аснове нелінейнага ўзаемадзеяння з рэчывам некалькіх кагерэнтных хваль. Выкарыстоўваецца для стварэння аптычных, оптаэлектронных і інтэгральна-аптычных элементаў з вял. хуткадзеяннем, лазераў з размеркаванай адваротнай сувяззю і інш.

Д.г. сфарміравалася як навук. кірунак у выніку сінтэзу ідэй класічнай галаграфіі і нелінейнай оптыкі; заснавана на ўзаемадзеянні некалькіх кагерэнтных хваль, якое ўзнікае пры праходжанні іх праз нелінейнае асяроддзе (крышталь, паўправаднік, вадкасць, пара металаў і інш.). Напр., 2 (ці больш) кагерэнтныя пучкі святла падаюць на паверхню нелінейнага асяроддзя пад аднолькавымі вугламі да яе і перасякаюцца ў ім. Створаная інтэрферэнцыйная карціна запісваецца ў асяроддзі ў выглядзе перыяд. структуры (рашоткі), на якой гэтыя ж пучкі дыфрагуюць (самадыфракцыя), што змяняе параметры пучкоў, і таму запісаная рашотка таксама змяняецца па глыбіні асяроддзя. *Галаграмы* запісваюцца ў асяроддзях з рознымі тыпамі нелінейнасці (рэзананснай, стрыкцыйнай, камбінацыйнай і інш.). Д.г. пашырае магчымасці кіравання светлавымі пучкамі, рэалізуе новыя прынцыпы рэгістрацыі і ўзнаўлення эл.-магн. хваль.

На Беларусі даследаванні па Д.г. распачаты ў 1968 у Ін-це фізікі Нац. АН пад кіраўніцтвам А.С.Рубанава і Б.І.Сцяпанава. Адкрыта новая фіз. з'ява — абарачэнне хвалевага фронту (1970, пры 4-хвалевым узаемадзеянні; 1978, пры суперлюмінесцэнцыі). Работы ў галіне Д.г. і яе дастасаваннях вядуцца ў Ін-тах фізікі, электронікі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нац. АН, БДУ і інш. *А.С.Рубанаў.*

ДЫНАМІ́ЧНАЯ ГЕАЛО́ГІЯ, адзін з кірункаў геалогіі, што вывучае знешнія і ўнутр. геал. працэсы, якія бесперапынна змяняюць састаў, структурна-тэкстурныя асаблівасці горных парод, будову зямной кары і формы зямной паверхні. З Д.г. вылучыліся асобныя галіны ведаў: *тэктоніка*, *вулканалогія*, *сейсмалогія*, *геамарфалогія* і інш. Найважнейшыя метады Д.г. — назіранне сучасных геал. працэсаў і іх мадэліраванне ў лабараторных умовах. Як навука ўзнікла ў 19 ст. Вял. ўклад у развіццё Д.г. зрабілі вучоныя англ. Ч.Лаель, аўстрыйскі Э.Зюс, рас. К.І.Багдановіч, І.В.Мушкетаў, У.А.Обручаў, У.У.Белаўсаў, Ю.Д.Буланжэ, В.Я.Хаін і інш., бел. Р.Я.Айзберг, З.А.Гарэлік, Р.Г.Гарэцкі, Г.У.Зінавенка, В.С.Канішчаў, Г.І.Каратаеў, Э.А.Ляўкоў, А.В.Мацвееў і інш.

ДЫНАМІ́ЧНАЯ РАЎНАВА́ГА ў жывой прыродзе, стан адноснай раўнавагі біясістэм. Накіраваны на падтрыманне іх асноўных характарыстык у пэўных межах, якія забяспечваюць існаванне гэтых сістэм. Уздзеянне знешніх і ўнутраных сіл (у т.л. антрапагеннага паходжання) на біясістэмы розных узроўняў (арганізм, біяцэноз) пры Д.р. не выклікае рэзкіх якасных змен асобных экалаг. сістэм (падсістэм біясферы) і пераходу іх да тэрмадынамічнай раўнавагі, уласцівай сістэмам неарганічнай прыроды. Вывучэнне заканамернасцей, механізмаў і ўмоў падтрымання Д.р. пры пастаянным росце антрапагеннага ўздзеяння на біятычнае і абіятычнае асяроддзе — цэнтр. задача аховы прыроды. На Беларусі вывучаецца ў некат. запаведніках.

Літ.: Водопьянов П.А. Устойчивость и динамика биосферы. Мн., 1981; Динамическое равновесие человека и природы. Мн., 1977.

ДЫНАМІ́ЧНАЯ СІСТЭ́МА, у першасным значэнні мех. сістэма з канечным

лікам ступеней свабоды (напр., сістэма матэрыяльных пунктаў або цвёрдых цел, якія рухаюцца па законах класічнай механікі). У эўрыстычным сэнсе (гл. *Эўрыстыка*) — сукупнасць фіз. аб'ектаў, для якіх характэрна адназначная залежнасць працэсаў, што працякаюць у іх, ад знешніх уздзеянняў, узаемных сувязей паміж аб'ектамі і іх пачатковых станаў. У больш шырокім сэнсе — адвольная фіз. сістэма (напр., сістэма аўтам. рэгулявання, радыётэхн. сістэма), якая апісваецца звычайнымі дыферэнцыяльнымі ўраўненнямі, а таксама сістэма такіх ураўненняў (незалежна ад яе паходжання).

У матэм. тэорыі Д.с. разглядаюцца матэм. мадэлі рэчаісных фіз. і мех. сістэм, якія адлюстроўваюць іх асн. ўласцівасці. Для апісання ўсіх тыпаў Д.с. выкарыстоўваюць метад уваходна-выхадных уяўленняў (метад «чорнай скрыні»; выяўленне адпаведнасці паміж уваходнымі і выхаднымі сігналамі) ці метад прасторы станаў (метад фазавай прасторы; выхадны сігнал залежыць ад стану Д.с., уваходнага сігналу і папярэдніх уваходных уздзеянняў). Складаныя Д.с. служаць мадэлямі розных фіз.-хім. асяроддзяў (напр., актыўнае рэчыва лазера, вязкая вадкасць), фізіял. органаў (мышца сэрца, нервовае валакно) і інш. На Беларусі даследаванні Д.с. праводзяцца з 1960-х г. у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН, у Бел. політэхн. акадэміі, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі і інш.

Літ.: Калман Р., Фалб П., Арбиб М. Очерки по математической теории систем: Пер. с англ. М., 1971; Крот А.М. Дискретные модели динамических систем на основе полиномиальной алгебры. Мн., 1990.

А.М.Крот.

ДЫНАМІ́ЧНАЯ ТРЫВА́ЛАСЦЬ матэрыялаў і канструкцый, здольнасць матэрыялаў або канструкцый супраціўляцца ўздзеянню дынамічных нагрузак без разбурэння ці без істотнай змены формы. Пры паўторна-пераменных нагрузках Д.т. характарызуецца мяжой *трываласці* матэрыялу, пры ўдары — значэннем макс. неразбуральнага напружання, якое ўзнікае ў саўдарных целах, ударнай *вязкасцю*. Д.т. канструкцый значна зніжаюць канструкцыйна-тэхнал. канцэнтратары напружанняў (адтуліны, месцы з неаднароднай структурай матэрыялу, рэзкія пераходы форм і інш.).

ДЫНАМІ́ЧНЫ СТЭРЭАТЫ́П, адносна ўстойлівая адаптыўная сістэма рэакцыі арганізма на ўздзеянні знешняга асяроддзя; адзін з найб. складаных феноменаў вышэйшай нерв. дзейнасці. Мае важнае значэнне ў адаптацыі жывёл і чалавека. Асновай Д.с. з'яўляецца фарміраванне сукупнасці сувязей і ўзаемаадносін паміж ачагамі ўзбуджэння і тармажэння ў кары вял. паўшар'яў галаўнога мозга ў адказ на шматразовае стэрэатыпнае ўздзеянне вызначаных камбінацый умоўных раздражняльнікаў, што змяняюць адзін аднаго і спадарожнічаюць індывіду ўсё жыццё. Як адзіны комплекс Д.с. складваецца ў выніку накладвання наступных стымулаў на сляды папярэдніх. На гэтай аснове ствараюцца звычкі, традыц. распарадак дня чалавека і інш. Д.с. выпрацоўваецца паступова, дасягае высокай устойлівасці, забяспечвае аўтам. эканомнае з пункту гледжання расходу нерв. энергіі прыстасаванне да змен наваколля, бо звыклая дзейнасць для арганізма значна лягчэйшая, чым новая. Са зменай абставін Д.с. зведвае перабудову, ступень цяжкасці якой залежыць ад характару раздражняльніка, асаблівасцей вышэйшай нерв. дзейнасці і можа прыводзіць да яе зрыву.

У.М.Калюноў.

ДЫНАМІ́ЧНЫЯ ЗАКО́НЫ, гл. *Статыстычныя і дынамічныя законы.*

ДЫНАМО́МЕТР (ад *дынама...* + *...метр*), прылада для вымярэння сілы



Рабочы спружынны **дынамометр** (работамер): 1, 4 — захваты; 2 — корпус з пругкім элементам; 3 — цыферблат са шкалой; 5 — стрэлка.

або моманту сілы. Бываюць: цягавыя — для вымярэння адной сілы (цягі) і вярчальныя — пары сіл (вярчальнага моманту); узорныя і рабочыя (агульнага прызначэння, спецыяльныя); пераносныя і стацыянарныя; мех. (спружынныя, рычажныя), гідраўл., эл. і інш.

Д. мае пругкі элемент, які дэфармуецца пад уздзеяннем сілы, і адліковае прыстасаванне для рэгістрацыі вымеранага намагання. З дапамогай Д. вымяраюць сілы ад некалькіх ньютанаў да 1 МН. Выкарыстоўваюць пры выпрабаваннях і эксплуатацыі машын, для вымярэння сілы рэзання або момантаў сіл, што ўзнікаюць пры апрацоўцы металаў (інструментальны Д.), мускульных намаганняў і інш. Д. з пішучым прыстасаваннем наз. дынамографам, з адліковым або паказвальным прыстасаваннем — работамерам ці імпульсіметрам.

ДЫНАМО́НЫ, сумесевыя *брызантныя выбуховыя рэчывы*: сумесь нітрату амонію NH_4NO_3 (акісляльнік) і невыбуховага гаручага (торф, драўняная мука, нафтапрадукты, парашкі металаў), якое лёгка акісляецца. Цеплата ўзрыву ў залежнасці ад складу 3—4,2 МДж/кг.

З тонкадысперснага NH_4NO_3 вырабляюць парашкападобныя Д., з сітаватага грануляванага — грануляваныя: грануліты (гранулы салетры, прамочаныя вадкім гаручым) і ігданіт (94—95% NH_4NO_3 і дызельнае паліва). Грануляваныя Д. ў параўнанні з парашкападобнымі менш гіграскапічныя і адчувальныя да мех. уздзеянняў. Выкарыстоўваюць для ўзрыўных работ на паверхні і пад зямлёй (акрамя шахтаў, небяспечных на газ і пыл). Гл. таксама *Дынаміты.*

ДЫНА́РСКАЕ НАГО́Р'Е (Dinarsko gorje), нагор'е на ПнЗ Балканскага п-ва, у Харватыі, Босніі і Герцагавіне, Югаславіі і паўн. Албаніі. Даўж. каля 650 км, шыр. да 230 км. Пераважаюць сярэднягор'і. Найвышэйшая вяршыня 2692 м (г. Езерца ў Паўн.-Алб. Альпах). Асн. хрыбты і масівы (Велебіт, Дынара, Дурмітар, Копаанік і інш.). Складзена пераважна з мезазойскіх вапнякоў (класічны карставы раён), на У са сланцаў і пясчанікаў. Дубова-букавыя і хвойныя лясы, міжземнаморскі хмызняк, горныя стэпы і пусткі. Нац. паркі Дурмітар (унесены ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*), Копаанік і інш.

ДЫ́НАС (ад назвы скалы Дынас ва Уэльсе, Вялікабрытанія), адзін з *вогнетрывалых матэрыялаў*. Складаецца пераважна (не менш як 93%) з крэменязёму. Атрымліваецца з кварцавых парод на вапнавай або іншай звязцы абпальваннем пры высокіх т-рах. Вогнетрываласць 1680—1730 °С. Выкарыстоўваецца пры мураванні прамысл. печаў (мартэнаўскіх, коксавых, шклаварных і інш.).

ДЫНА́СТЫЯ (ад грэч. dynasteia улада, панаванне), 1) шэраг манархаў з аднаго роду, якія паслядоўна змяняюць адзін аднаго паводле права роднасці і атрымання спадчыны. 2) Пераносна — некалькі пакаленняў адной сям'і, якія атрымалі вядомасць у пэўнай галіне дзейнасці (напр., акцёрская Д. і інш.).

ДЫ́НГА (Canis dingo), млекакормячае сям. воўчых атр. драпежных. Некат. вучоныя разглядаюць Д. як падвід здзічэлага свойскага сабакі. Пашырана ў Аўстраліі, верагодна, разам з пранік-

Дынга.

неннем чалавека. Жыве пераважна на адкрытых раўнінах або ў разрэджаных лясах. Начная і змрокавая жывёла, трымаецца невял. зграямі.

Даўж. цела 90—110 см. Целасклад зграбны, ногі моцныя, кароткія, прамыя. Вушы стаяць, хвост пушысты. Валасяное покрыва густое, мяккае. Звычайная афарбоўка ржава-рыжая або рыжа-бурая; трапляюцца белыя, плямістыя, шэрыя, амаль чорныя асобіны. Нараджае 4—8 шчанят. Корміцца дзікімі і свойскімі жывёламі.

ДЫ́ННАЕ ДРЭ́ВА, папайя (Carica papaya), пладовае дрэва сям. карыкавых. Культывуецца ў трапічных краінах Амерыкі, Афрыкі і Паўд.-Усх. Азіі. Радзіма — Цэнтр. Амерыка. Адно з старажытных культ. раслін. Хуткарослае, недаўгавечнае (у культуры замяняюць праз 3—5 гадоў).

Дыннае дрэва.

Дыня: 1 — сорт Босвалды; 2 — сорт Калгасніца.

Вечназялёнае дрэва выш. 4—7 м, без галін. На верхавіне разетка з буйнога лісця на доўгіх чаранках. Суквецці вісячыя, кветкі крэмавыя або белыя, часцей аднаполыя. Плод — ягада (даўж. да 30 см, маса 3—6 кг), падобная на дыню (адсюль назва). Спажываюць як дыетычны прадукт. З млечнага соку няспелых пладоў і лісця атрымліваюць фермент папаін, які выкарыстоўваецца ў харч. і лёгкай прам-сці.

ДЫНО́Д [ад грэч. dyn (amis) сіла + (*электр*)*од*], электрод у *фотаэлектронных памнажальніках*, некат. электронных лямпах і інш. прыладах, які выпрамяняе больш электронаў, чым трапляе на яго. Гл. таксама *Другасная электронная эмісія*.

ДЫ́НЬКА ў архітэктуры, дэкаратыўная дэталь (патаўшчэнне) слупоў, калонак, ліштваў акон і дзвярных пар-

Дынькі на фасадах былога Пазямельна-сялянскага банка ў Віцебску (уверсе) і Пакроўскай царквы ў Гродне.

талаў. Мае круглую або крыху падоўжаную (дынепадобную) форму. Была пашырана ў рус. мураванай архітэктуры 15—17 ст., у драўляным дойлідстве — да канца 18 ст. На Беларусі сустракаецца пераважна ў пабудовах 19 — пач. 20 ст. стыляў псеўдарускага і мадэрн (будынак Пазямельна-сялянскага банка ў Віцебску, Пакроўская царква ў Гродне і інш.).

ДЫ́НЯ (Melo), род аднагадовых травяністых раслін сям. гарбузовых. Вядома 15 відаў (у культуры 9). Радзіма — Сярэдняя і М. Азія. Вырошчваецца ў краінах з сухім, цёплым кліматам. На Пд Беларусі ў аматарскіх пасевах выро-

шчваюць Д. звычайную, ці сталовую (M. sativus).

Д. звычайная — расліна з паўзучым сцяблом даўж. да 3—4 м, укрытым цвёрдымі валаскамі. Лісце на доўгіх чаранках, суцэльнае або лопасцевае, апушанае, з вусікамі ў пазухах. Кветкі часцей аднаполыя, ярка-жоўтыя, развіваюцца ў пазухах лісця. Плод — шматнасенная несапраўдная ягада з сакаўной, салодкай, духмянай мякаццю, багатай цукрам (да 18%), вітамінам С (да 60 мг%), карацінам, мінер. солямі. Каштоўная харч., дыетычная культура. З мякаці атрымліваюць мёд (бекмез). Сарты: Калгасніца, Грунтавая грыбаўская, Алтайская.

ДЫО́ЛЫ, тое, што *Гліколі*.

ДЫПІРАМІ́ДА (ад *ды...* + *піраміда*), шматграннік, утвораны 2 пірамідамі, якія як быццам злучаны асновамі. У залежнасці ад формы шматвугольнай асновы піраміды і колькасці граней адрозніваюць гексаганальную (12 граней), дыгексаганальную (24), дытэтраганальную (16), дытрыганальную (12), рамбічную (8), тэтраганальную (8), трыганальную (6). Выкарыстоўваецца ў крышталяграфіі.

ДЫПЛАДО́КІ (Diplodocus), род вымерлых паўзуноў падатр. заўрапод атр. яшчаратазавых дыназаўраў. 3—4 віды. Вядомы з юры Паўн. Амерыкі і Пд Англіі. Упершыню рэшткі Д. выяўлены ў штаце Каларада (1887).

Даўж. да 27 м, маса каля 10 т. Зграбныя жывёлы з невял. галавой, тонкай доўгай шыяй і доўгім прутападобным хвастом. Магутная спінная мускулатура дазваляла адрываць пярэднія ногі ад зямлі і падымацца на задніх, каб дацягвацца да крон дрэў. Маса ног складала амаль палову масы цела. Мускулатура мацавалася пры дапамозе высокіх асцістых адростка ў крыжавых і злучаных з імі спінных і хваставых пазванкоў. На ніжняй паверхні хваставых пазванкоў былі двайныя (парныя) адросткі для засцярогі хваста, калі ён цягнуўся па зямлі (адсюль назва роду, якая азначае «двайны адростак», або «двухадросткавая істота». Насавыя адтуліны і вочы размяшчаліся на вяршыні чэрапа. Зубы нешматлікія, слабыя, былі толькі ў пярэдняй частцы сківіц. Расліннаедныя, кармліся мяккай воднай і наземнай расліннасцю. *П.Ф.Каліноўскі.*

ДЫПЛАДЫЁЗЫ, хваробы раслін, якія выклікаюцца недасканалымі грыбамі з роду Diplodia. Пашкоджваюць каля 40 відаў раслін, у т.л. кукурузу, рыс, бавоўнік, вінаград, бахчавыя, цытрусавыя і інш. трапічныя і субтрапічныя культуры, развіваюцца таксама на плодаагародніннай прадукцыі пасля ўборкі.

Напр., пры Д. кукурузы на пачатках утвараецца белы налёт, хворыя зярняўкі робяцца цёмна-карычневыя; на сцёблах каля ніжніх вузлоў — пераломы міжвузелляў, белы налёт і чорныя пладовыя целы. Лісце і ліставыя похвы пакрываюцца цёмна-карычневымі плямамі. Ураджайнасць значна зніжаецца, пагаршаюцца харч. якасці зерня і ўсходжасць насення.

ДЫПЛАКО́КАВАЯ ІНФЕ́КЦЫЯ, дыплакокавая септыцэмія, інфекцыйная хвароба жывёл, якая выклікаецца ланцэтападобным дыплакокам

(Diplococcus septicus). Хварэюць цяляты, ягняты, парасяты, жарабяты, часцей ва ўзросце ад 15 сутак да 2,5 месяцаў. У маладняку працякае са з'явамі пнеўманіі, сепсісу і запалення суставаў, у дарослых жывёл — у форме паслярадавых эндаметрытаў і мастытаў. Заражэнне адбываецца пераважна праз інфіцыраванае малако маці, рэспіраторным шляхам. Пашырана ўсюды, бываюць групавыя ўспышкі (*энзаотыі*).

Дыпладок.

ДЫПЛАКО́КІ, від *бактэрый* шарападобнай формы (кокі), размешчаных парамі. Будова Д. абумоўлена тым, што пры дзяленні бактэрый у адной плоскасці 2 новыя асобіны не разыходзяцца. У Д. адсутнічаюць жгуцікі, яны не ўтвараюць споруў. Сярод Д. ёсць сапрафіты, якія жывуць у глебе, вадзе, і ўзбуджальнікі інфекц. хвароб — пнеўмакокі, менінгакокі, ганакокі і інш.

ДЫПЛАМА́НТ (ад *дыплом*), 1) асоба, узнагароджаная ганаровым дыпломам за высокую якасць выканання работы, ролі і інш. на конкурсе, фестывалі, выстаўцы і г.д. 2) Студэнт выпускнога курса ін-та, тэхнікума, каледжа, які выконвае або абараняе дыпломную работу.

ДЫПЛАМА́Т (франц. diplomate), службовая асоба ўстановы органаў знешніх зносін дзяржавы або *дыпламатычнага прадстаўніцтва* дзяржавы за мяжой. У адпаведнасці са сваім статусам прымае непасрэдны ўдзел у ажыццяўленні функцый у галіне афіц. кантактаў з замежнымі дзяржавамі, мае *дыпламатычны ранг* або *клас дыпламатычны* і, як правіла, карыстаецца дыпламат. *імунітэтам*.

ДЫПЛАМА́ТЫКА (франц. diplomatique ад грэч. diplōma ліст, дакумент, складзены ў дзве столкі), спецыяльная гіст. дысцыпліна, якая вывучае паходжанне, форму і змест актавых крыніц (пераважна эпохі феадалізму) для вызначэння іх сапраўднасці. Праверка сапраўднасці актаў (практычная Д.), выкліканая барацьбой за зямлю і феад. прывілеі, вялася ўжо ў сярэдневякоўі. У 14—15 ст. пачала развівацца навук. Д. Падыходы і крытэрыі праверкі сапраўднасці дакументаў распрацаваў франц. даследчык Ж.Мабільён. Сучасная Д. з'яўляецца часткай агульнага *крыніцазнаўства*, у задачы якой уваходзіць даследаванне форм і зместу дакументаў. На Беларусі ў 16—19 ст. мела месца фальсіфікацыя дакументаў, выкрыццё якой прывяло да зараджэння практычнай Д. Напр., вядома, што ў 1721—43 князі Радзівілы зрабілі фальшывы дакумент ад імя караля польскага і вял. князя літ. Жыгімонта II Аўгуста з датай 3.11.1551, паводле якога атрымалі права захоўваць дзярж. дакументы ВКЛ у сваім прыватным архіве ў Нясвіжы. Так Нясвіжскі архіў Радзівілаў станавіўся роўным з дзярж. архівам ВКЛ. У 1-й пал. 19 ст. распаўсюдзіліся падробкі дакументаў аб прыналежнасці да шляхецкага саслоўя ў сувязі з праверкай правоў на дваранства ў зах. губернях Рас. імперыі пасля падаўлення паўстання 1830—31 у Польшчы, Літве і Беларусі. Фабрыкацыя фальшывых дакументаў пра шляхецкае паходжанне асабліва пашырылася ў 1830-я г. ў Мінску, дзе спецыялісты па-майстэрску скарыстоўвалі даўнюю мову, падрабляліі почырк і пячаткі каралёў, ужываючы паперу са стараж. актавых кніг.

Літ.: Лихачев Н.П. Дипломатика. СПб., 1901; Зимин А.А. Методика издания древнерусских актов. М., 1959; Каштанов С.М. Русская дипломатика. М., 1988; Актовое источниковедение: Сб. статей. М., 1979.

А.П.Грыцкевіч.

ДЫПЛАМАТЫ́ЧНАЕ ПРА́ВА, сукупнасць міжнар. прававых норм, якія рэгламентуюць статус *дыпламатычных прадстаўніцтваў* і супрацоўнікаў у дзейнасці па падтрымцы афіц. зносін з інш. дзяржавамі ці з міжнар. арг-цыямі; галіна міжнар. *публічнага права*.

ДЫПЛАМАТЫ́ЧНАЕ ПРАДСТАЎНІ́ЦТВА, замежны орган знешніх зносін дзяржавы. Д.п., якое ўзначальвае пасол, называецца *пасольствам*; якое ўзначальвае пасланнік або пастаянны павераны ў справах — *місіяй*. Прававы статус Д.п. вызначаецца Венскай канвенцыяй аб дыпламат. зносінах 1961, двухбаковымі пагадненнямі дзяржаў і ў пэўных межах нормамі нац. права дзяржавы знаходжання і дзяржавы прызначэння. Прававы статус Д.п. пры міжнар. і міжурадавых арг-цыях вызначаецца з улікам Венскай канвенцыі аб прадстаўніцтвах дзяржаў у іх дачыненнях з міжнар. арг-цыямі універсальнага характару 1975.

Ю.П.Броўка.

ДЫПЛАМАТЫ́ЧНЫ АКТ, дзеянне або заява органаў знешніх зносін і службовых асоб суб'ектаў міжнар. права, якія цягнуць за сабой міжнар.-паліт. або прававыя вынікі. Міжнар. практыка выпрацавала разнастайныя Д.а. (устанаўленне дыпламат. адносін, уручэнне *даверчых грамат*, заявы з выкладаннем пазіцыі і да т.п.). Іх выкарыстанне вызначаецца міжнар. звычаямі і пагадненнямі, пратакольнымі правіламі і нормамі ўнутрыдзярж. права па пытаннях дыпламат. службы. Пад Д.а. разумеюцца таксама пісьмовыя дыпламат. дакументы (*дагавор міжнародны*, *нота*, *мемарандум* і інш.).

ДЫПЛАМАТЫ́ЧНЫ ІМУНІТЭ́Т, гл. *Імунітэт*.

ДЫПЛАМАТЫ́ЧНЫ КО́ДЭКС КАФЕДРА́ЛЬНАГА САБО́РА І ВІ́ЛЕНСКАЙ ДЫЯЦЭ́ЗІІ (Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej), збор дакументальных матэрыялаў па гісторыі *Віленскай рымска-каталіцкай епархіі*, падрыхтаваны праф. Ягелонскага ун-та (Кракаў) Я.Фіялкам (1864—1936) і У.Сямковічам. Быў разлічаны на 2 тамы з дакументаў ад заснавання дыяцэзіі (1387) да смерці біскупа В.Пратасевіча (1579). 1-ы том выдадзены ў 2 выпусках (1932 і 1939; у 1948 перавыдадзены адной кнігай). У аснове выдання — архіўныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Цэнтр. б-цы АН Літвы ў Вільнюсе, а таксама каронная метрыка з Гал. архіва стараж. актаў у Варшаве, друкаваныя выданні, дакументы з прац Я.Длугаша, М.Стрыйкоўскага, І.М.Даніловіча і інш., усяго больш за 650 дакументаў. Збор мае вял. даведачны апарат, у 1997 асобнай кнігай выйшаў паказальнік імён і геагр. назваў. 2-і том рыхтуецца да выдання.

Публ.: Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej. T. 1 (1387—1507). Kraków, 1948.

Літ.: Ochmański J. Powstanie i rozwój latyfundium biskupstwa wileńskiego (1387—1550). Poznań, 1963; Яго ж. Biskupstwo wileńskie w średniowieczu. Poznań, 1972.

Г.Я.Галенчанка.

ДЫПЛАМАТЫ́ЧНЫ КО́РПУС, кіраўнікі *дыпламатычных прадстаўніцтваў*, акрэдытаваных у краіне. Д.к. у шырокім сэнсе — усе дыпламаты, што працуюць у дыпламат. прадстаўніцтвах у дадзенай краіне, а таксама з пэўнымі абмежаваннямі і члены іх сем'яў: жонка (муж) дыпламата і непаўналетнія дзеці, паводле міжнар. звычаю і дарослыя незамужнія дочкі дыпламата, што пражываюць сумесна з ім і знаходзяцца на яго ўтрыманні. Узначальвае корпус *дуаен*. Д.к. не з'яўляецца юрыд. асобай ці паліт. утварэннем. Ніякія сумесныя паліт. выступленні з боку Д.к. недапушчальныя: ад яго імя могуць рабіцца калект. заявы выключна па пратакольных, пераважна цырыманіяльных, пытаннях.

Ю.П.Броўка.

ДЫПЛАМАТЫ́ЧНЫЯ РА́НГІ, службовыя званні работнікаў дыпламатычнай

службы. Кожная дзяржава мае сваю сістэму Д.р. Паводле Пастановы Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь ад 24.4.1992 і Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6.4.1995 для дыпламат. работнікаў Беларусі ўстаноўлены наст. Д.р.: надзвычайны і паўнамоцны пасол, надзвычайны і паўнамоцны пасланнік 1-га і 2-га класа, саветнік 1-га і 2-га класа, першы сакратар 1-га і 2-га класа, другі сакратар 1-га і 2-га класа, трэці сакратар, *аташэ*. Парадак прысваення Д.р. рэгламентуецца заканадаўствам.

Ю.П.Броўка.

ДЫПЛАМА́ТЫЯ (франц. diplomatie), сукупнасць прыёмаў, форм і метадаў, з дапамогай якіх праводзіцца ў жыццё знешняя палітыка дзяржавы. У паняцце «Д.» ўваходзіць афіц. дзейнасць на міжнар. арэне кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, мін-ваў замежных спраў, дыпламат. прадстаўніцтваў у замежных дзяржавах і пры штабах-кватэрах міжнар. і міжурадавых арг-цый, урадавых дэлегацый на міжнар. канферэнцыях і на сесіях кіруючых органаў міжнар. арг-цый па рэалізацыі знешнепаліт. намаганняў дзяржавы, абароне яе правоў і інтарэсаў, а таксама па абароне правоў і інтарэсаў яе ўстаноў і асобных грамадзян. З паняццем «Д.» звязана майстэрства вядзення перагавораў у мэтах прадухілення і ліквідацыі міжнар. канфліктаў, дасягнення на міжнар. арэне прынцыповых кампрамісаў і агульнакарысных рашэнняў, паглыблення ўсебаковага міжнар. супрацоўніцтва. Д. рэалізуецца з дапамогай замежных візітаў кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, міністраў замежных спраў, інш. афіц. дзярж. асоб, двухбаковых і шматбаковых перагавораў, афіц. перапіскі, заключэннем дагавораў, канвенцый і пагадненняў. Дыпламат. дзейнасць кожнай дзяржавы павінна ажыццяўляцца з улікам патрабаванняў агульнапрынятых прынцыпаў і норм сучаснага міжнар. права. Паводле арт. 18 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь бел. дыпламаты прытрымліваюцца знешнепаліт. курсу, які адпавядае прынцыпам роўнасці суверэнных дзяржаў, невыкарыстання сілы ці пагрозы ўжыць сілу, непарушнасці дзярж. граніц, мірнага ўрэгулявання міждзяржаўных спрэчак і канфліктаў, неўмяшання ва ўнутр. справы інш. дзяржаў, дабіваюцца ўмацавання міру ва ўсім свеце, хутчэйшага і поўнага раззбраення пад эфектыўным міжнар. кантролем, поўнай забароны выкарыстання ядз. зброі і інш. зброі масавага знішчэння, спынення вытв-сці такой зброі, усебаковага раўнапраўнага міждзярж. супрацоўніцтва, якое накіравана на вырашэнне самых розных паліт., эканам., сац., культ., экалагічных, навук.-тэхн. і інш. праблем, што стаяць перад сучаснай міжнар. супольнасцю.

Літ.: История дипломатии. Т. 1—3. 2 изд. М., 1959—65; Левин Д.Б. Дипломатия: Ее сущность, методы и формы. М., 1962; Николсон Г. Дипломатическое искусство: Пер. с англ. М., 1962; Сатоу Э. Руководство по дипломатической практике: Пер. с англ. М., 1961. *Ю.П.Броўка.*

ДЫПЛАФА́ЗА (ад грэч. diploos двайны + *фаза*), фаза развіцця арганізмаў ад утварэння *зіготы* да ўступлення мацярынскай клеткі мікра- ці макраспор у мейтычнае дзяленне. Характарызуецца двайным (дыплоідным) наборам храмасом у клетках (гл. *Дыплоід*). Пераважае ў жыццёвым цыкле кветкавых раслін. Гл. таксама *Гаплафаза*.

ДЫПЛО́ІД (ад грэч. diploos двайны + eidos від), асобіна або клетка з двайным (поўным) наборам гамалагічных пар храмасом. Утвараецца ад зліцця 2 гаплоідных *гамет* (мужчынскай і жаночай), кожная з якіх мае па аднаму набору храмасом. Дыплоіднымі з'яўляюцца *спарафіты* вышэйшых раслін, пераважная большасць жывёл, гаметы паліплоідных арганізмаў (гл. *Поліплаідыя*) або гаметы, якія ўзніклі ў дыплоідных асобін з парушаным мееозам.

ДЫПЛО́М (франц. diplôme ад грэч. diplōma ліст, дакумент, складзены ў дзве столкі), 1) афіцыйнае пасведчанне аб заканчэнні навуч. установы, прысуджэнні вуч. ступені, прысваенні вуч. звання, атрыманні прэміі (Д. лаўрэата) і інш. 2) Афіцыйнае пасведчанне аб навук. адкрыцці або вынаходстве. 3) Узнагарода за пэўныя заслугі, дасягненні, поспехі.

ДЫПО́ЛЬ (ад *ды...* + грэч. polos полюс), 1) Д. электрычны — сістэма з 2 роўных па абс. значэнні і розных па знаку засяроджаных (кропкавых) эл. зарадаў (q), размешчаных на некат. адлегласці l адзін ад аднаго. Характарызуецца эл. *дыпольным момантам* $p = ql$.

На вял. адлегласцях ад Д. ($r >> l$) яго эл. поле вызначаецца формуламі $\varphi = (2p\cos\Theta)/4\pi\varepsilon_0 r^2$, $E_r = (2p\cos\Theta)/4\pi\varepsilon_0 r^3$, $E_\Theta = (2p\sin\Theta)/4\pi\varepsilon_0 r^3$, дзе φ — патэнцыял, E_r — радыяльная і E_Θ — трансверсальная кампаненты напружанасці $\vec{E}$ у пункце назірання з радыус-вектарам $\vec{r}$, Θ — вугал паміж вектарамі $\vec{p}$ і $\vec{r}$, ε_0 — эл. пастаянная. Д. з пастаянным дыпольным момантам ($\vec{p}$) стварае патэнцыяльнае (безвіхравое) поле, Д. з пераменным момантам з'яўляецца крыніцай выпрамянення эл.-магн. хваль.

2) Д. магнітны — сістэма з 2 роўных па абс. значэнні і розных па знаку фіктыўных магн. зарадаў (полюсаў), размешчаных на некат. адлегласці адзін ад аднаго. Лічыцца, што ў макраскапічным сэнсе магн. зарадаў (адасобленых магн. полюсаў) не існуе, аднак



Да арт. **Дыполь**. Лініі напружанасці вектара $\vec{E}$ электрычнага поля дыполя, p — электрычны дыпольны момант.

магн. поле замкнутых эл. токаў на вял. адлегласцях супадае з полем, якое стварыў бы магн. Д. Асн. характарыстыка магн. Д. — *магнітны момант*. Гл. таксама *Манаполь магнітны*. *А.І.Болсун.*

ДЫПО́ЛЬНЫ МО́МАНТ, вектарная фізічная велічыня, якая характарызуе ўласцівасці *дыполя*. 1) Электрычны Д.м. — вектар па модулі, роўны $p=ql$, дзе q — дадатны эл. зарад дыполя, l — адлегласць паміж зарадамі (плячо дыполя), і накіраваны ад адмоўнага зараду да дадатнага. Д.м. вызначае эл. поле дыполя на вял. адлегласцях ад яго, а таксама ўздзеянне на дыполь знешніх эл. і магн. палёў. Адзінка эл. Д.м. ў СІ — кулон-метр, пазасістэмная адзінка — *дэбай*. 2) Магнітны Д.м. — тое, што *магнітны момант*.

ДЫПСАМА́НІЯ (ад грэч. dipsa смага + *манія*), гл. ў арт. *Запой*.

ДЫ́ПЦІХ (ад грэч. diptychos падвойны, складзены ў дзве столкі), два творы выяўл. мастацтва, аб'яднаныя адзінай задумай. У Стараж. Грэцыі і Стараж. Риме Д. называлі 2 пакрытыя воскам дошчачкі для пісьма, у мастацтве сярэдневякоўя — двухстворкавы *складзень* з рэльефнымі або жывапіснымі выявамі. Сярод Д., створаных бел. мастакамі: творы «Бетон» Г.Вашчанкі (1970), «Маці» і «Урачы» А.Малішэўскага (абодва 1975), «І кветкі, і хлеб — паэтам» А.Марачкіна (1982), «Плач Яраслаўны» Г.Паплаўскага (1984) і інш.

«ДЫРЛЕВА́НГЕР» («Dirlewanger»), кодавая назва карнай аперацыі ням.-фаш. захопнікаў на акупіраванай тэр. Беларусі ў Вял. Айч. вайну супраць партызан і цывільнага насельніцтва ў Смалявіцкім і Лагойскім р-нах Мінскай вобл. Адбылася ў 2-й дэкадзе сак. 1943. Паводле загаду нач. паліцыі бяспекі і СД оберштурмбанфюрэра СС Штрауха праводзіў аперацыю асобы батальён СС пад камандаваннем оберштурмбанфюрэра СС А.Дырлевангера з дапамогай каманды СД і каманды радыёсувязі «Пайгот». Па няпоўных звестках, гітлераўцы праводзілі аперацыю ў вёсках Дуброўка, Ляды, Прылепы, Халмецічы. Вёска Прылепы была спалена, 29 яе жыхароў расстраляны, 22 сак. спалена разам з жыхарамі в. *Хатынь*, на месцы якой створаны мемар. комплекс *Хатынь*.

ДЫРЫЖА́БЛЬ (ад франц. dirigeable кіроўны), кіроўны *аэрастат* падоўжанай формы, аснашчаны адной або некалькімі вінтаматорнымі ўстаноўкамі, якія ствараюць цягу для гарыз. палёту. Вызначаецца вял. грузападымальнасцю і далёкасцю палёту, невял. (да 150 км/гадз) скорасцю, павышанай залежнасцю ад метэаўмоў.

Адрозніваюць Д. мяккай сістэмы (аб'ём 1—7 тыс. м^3, корпус з прагумаванага матэрыялу, што служыць адначасова і абалонкай для газу), паўжорсткай (8—35 тыс. м^3, у ніжняй ч. мае метал. ферму, якая не дапускае дэфар-

мацыі абалонкі) і жорсткай (да 200 тыс. м^3, увесь корпус у выглядзе метал. каркаса). Д. маюць адну або некалькі *гандол* (для размяшчэння экіпажа, рухавікоў, грузаў), апярэнне (стабілізатары, кілі, рулі вышыні і кіравання). Выкарыстоўваліся для перавозкі грузаў, у навук. і ваен. мэтах і інш. Першы палёт на Д. з паравым рухавіком ажыццявіў А.Жыфар у 1852 (Францыя). Першы Д. жорскай сістэмы пабудаваў у 1900 Ф.Цэпелін (Германія), першы Д. мяккай сістэмы грамадз. прызначэння спрактаваў і пабудаваў у 1911 у Кіеве Ф.Ф.Андэрс. Гл. таксама *Паветраплаванне*.

Да арт. **Дыпціх**. Плач Яраслаўны. Маст. Г.Паплаўскі. 1984.

ДЫРЫЖЫ́РАВАННЕ (ад франц. diriger напраўляць, кіраваць), кіраванне калектывам музыкантаў (аркестрам, хорам, ансамблем, опернай ці балетнай трупай і інш.) у працэсе падрыхтоўкі і ў час публічнага выканання ім муз. твора; адзін з відаў музычна-выканальніцкага мастацтва. Здзяйсняецца дырыжорам, які імкнецца перадаць калектыву сваю *інтэрпрэтацыю* задумы кампазітара, забяспечвае ансамблевую стройнасць і тэхн. дасканаласць выканання пры ўзнаўленні тэксту *партытуры*. Мастацтва Д. заснавана на спец. сістэме жэстаў рук; вял. ролю ў ім адыгрываюць таксама твар дырыжора, яго позірк, міміка. Значнае месца займае ў Д. тактаванне — абазначэнне (пераважна правай рукой) метрарытмічнай структуры музыкі; левай рукой звычайна даюцца ўказанні ў сферы дынамікі, фразіроўкі (у практыцы, аднак, пашырана свабоднае ўзаемапранікненне функцый абедзвюх рук). Д. патрабуе ад дырыжора шырокай адукаванасці, грунтоўнай муз.-тэарэт. падрыхтоўкі, тонкага слыху, добрай муз. памяці, актыўнай мэтанакіраванай волі.

Д. вядома з глыбокай старажытнасці. Напачатку ў нар.-хар. практыцы функцыі дырыжора выконваў адзін са спевакоў — запявала. У старажытнасці ў Егіпце, Грэцыі, пазней у краінах сярэдневяковай Еўропы хорам кіравалі з дапамогай хейраноміі — умоўных рухаў рук і пальцаў. З 15 ст. для адбівання такта выкарыстоўвалі палачку-батуту. У капэлах звычайна капельмайстры спалучалі Д. з выкананнем партыі генерал-баса (на клавесіне ці аргане) ці 1-й скрыпкі. З 2-й пал. 18 ст., па меры адмірання генерал-баса, скрыпач-канцэртмайстар становіцца адзіным кіраўніком ансамбля (у 20 ст. — пры выкананні музыкі 17—18 ст). Як самаст. від мастацтва Д. склалася ў 2-й чвэрці 19 ст. Сярод першых дырыжораў, што карысталіся дырыжорскай палачкай, І.Мозель, К.М.Вебер, Л.Шпор. Адзін з заснавальнікаў сучаснага Д. (побач з Л.Бетховенам, Г.Берліёзам, Ф.Лістам, Ф.Мендэльсонам) — Р.Вагнер. Паступова склаўся тып дырыжора-выканаўцы, які не з'яўляецца адначасова і кампазітарам (першы — Г.Бюлаў). Сярод буйнейшых замежных дырыжораў 19—20 ст. Г.Рыхтэр, Г.Малер, Г. фон Караян (Аўстрыя), А.Нікіш, Я.Ферэнчык (Венгрыя), Ф.Мотль, Ф.Вейнгартнер, К.Мук, Р.Штраус, Б.Вальтэр, В.Фуртвенглер, О.Клемперэр, Г.Абендрот, К.Мазур, К.Зандэрлінг (Германія), А.Тасканіні, К.Абада (Італія), П.Манцё, Ш.Мюнш, А.Клюітэнс, І.Маркевіч (Францыя), Т.Бічэм, А.Боўлт, А.Коўтс (Вялікабрытанія), В.Бярдзяеў, Г.Фітэльберг (Польшча), В.Ментельберг (Нідэрланды), Л.Стакоўскі, Дж.Сел, Л.Бернстайн (ЗША), Э.Ансермэ (Швейцарыя), Д.Мітропулас (Грэцыя), В.Таліх (Чэхія, Славакія), Л.Матачыч (Югаславія), Дж. Джарджэску (Румынія). У Расіі найб. вядомыя дырыжоры 18 — 2-й пал. 19 ст. — В.Пашкевіч, І.Хандошкін, М.Балакіраў, Э.Напраўнік, А. і М.Рубінштэйны, 20 ст. — М.Галаванаў, С.Кусявіцкі, А.Пазоўскі, С.Рахманінаў, С.Самасуд, В.Сафонаў, В.Сук, пазней А.Гаўк, В.Гергіеў, В.Дударава, І.Зак, К.Іваноў, К.Кандрашын, Д.Кахідзе, Дз.Кітаенка, М.Малько, А.Мелік-Пашаеў, Я.Мравінскі, І.Мусін, Н.Ніязі, Г.Раждественскі, Н.Рахлін, Я.Святланаў, Ю.Сіманаў, К.Сімяонаў, У.Співакоў, Ю.Фаер, У.Федасееў, Б.Хайкін, Ю.Цемірканаў, А.Янсанс і інш. На Беларусі ў 19 ст. вылучыліся І.Дабравольскі, Ю.Дашчынскі, браты В. і Д.Стафановічы, у 20 ст. — хар. дырыжоры М.Дрынеўскі, А.Кагадзееў, Н.Ламановіч, І.Мацюхоў, Г.Пятроў, В.Роўда, Г.Цітовіч, Р.Шырма, Л.Яфімава, нар. аркестра — І.Жыновіч, Дз.Захар, М.Казінец, оперна-сімф. — І.Абраміс, А.Анісімаў, Б.Афанасьеў, Я.Вашчак, І.Гіттарц, Н.Грубін, В.Дуброўскі, Т.Каламійцава, М.Калядка, Л.Любімаў, Л.Лях, У.Машэнскі, Г.Праваторaў, Ю.Цырук, А.Энгельбрэхт, Ю.Яфімаў, эстр. аркестра — Ю.Бяльзацкі, Б.Райскі, Э.Рознер, М.Фінберг і інш. Харавых і оперна-сімф. дырыжораў рыхтуе Бел. акадэмія музыкі, Бел. ун-т культуры.

Літ.: Вагнер Р. О дирижировании: Пер. с нем. СПб., 1900; Ольхов К.А. Теоретические основы дирижерской техники. 2 изд. Л., 1984; Хайкин Б. Беседы о дирижерском ремесле. М., 1984; Когадеев А.П. Техника хорового дирижирования. Мн., 1968.

Л.А.Сівалобык.



Схема **дырыжабля** жорсткай сістэмы: 1, 4 — стабілізатары; 2, 3 — рулі напрамку і вышыні; 5 — вонкавая абалонка; 6 — гандола кіравання; 7 — пасажырскія палубы; 8 — месца бакавой маторнай гандолы.

ДЫ́РЭ-ДА́ЎА, Дырэдава, горад на У Эфіопіі. 173,6 тыс. ж. (1993). Чыг. станцыя на чыг. Джыбуці—Адыс-Абеба, вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: тэкст., цэм., харчовая. Чыг. майстэрні. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (кава, жывёла).

ДЫРЭКТО́РЫЯ, Выканаўчая Дырэкторыя (Directoire exécutif), урад Франц. рэспублікі ў ліст. 1795—ліст. 1799. Складалася з 5 чл. (дырэктараў), якіх выбіраў Савет пяцісот і Савет старэйшын. Выражала інтарэсы буйной буржуазіі. Унутр. палітыка была скіравана на барацьбу з рэв. рухам, знешняя мела захопніцкі характар. Пасля некалькіх «хістанняў» Д. то ўправа (рашэнне пра ануляванне выбараў дэпутатаў-дэмакратаў), то ўлева (са складу Д. выведзены адкрытыя рэакцыянеры) яе дзеянні сучаснікі назвалі «палітыкай арэляў». Спыніла сваё існаванне пасля дзярж. пераваротy Напалеона Банапарта.

ДЫРЭКТО́РЫЯ УКРАІ́НСКАЯ, гл. *Украінскай дырэкторыі ўрад*.

ДЫРЭКТРЫ́СА (франц. directrice ад позналац. directrix накіравальная), прамая, якая ляжыць у плоскасці *канічнага сячэння* і характарызуецца тым, што адносіны адлегласці *r* паміж кожным пунктам *M* гэтага сячэння і яго фокусам *F* да адлегласці *d* паміж гэтым жа пунктам і гэтай прамой ёсць велічыня пастаянная, роўная эксцэнтрысітэту ε крывой: $r/d = \varepsilon$. Гіпербала і эліпс маюць па 2 Д. (па адной для кожнага фокуса), парабала — адну.



Дырэктрыса: 1 — эліпса Δ_1, Δ_2; 2 — парабалы Δ

ДЫРЭКТЫ́ВА (франц. directive ад лац. dirigere накіроўваць), распараджэнне, кіруючае ўказанне, настаўленне, якія даюцца вышэйстаячым органам ніжэйстаячаму ці кіраўніком установы падначаленаму.

ДЫС..., перад галоснымі д ы з... (лац. dis..., грэч. dys...), прыстаўка, якая абазначае парушэнне, разлад, страту чаго-н.; адпавядае па значэнні прыстаўкам раз..., не..., напр., *дысгармонія*, *дысрапорцыя*, *дызурыя*.

ДЫСАНА́НС (франц. dissonance ад лац. dissono нязладжана гучу) у м у з ы ц ы, адначасовае спалучэнне тонаў рэзкага няўзгодненага гучання. Процілеглае Д. паняцце — «*кансананс*». Тэрміны «Д.» і «кансананс» паасобку эстэтычна не ацэньваюцца. Іх нельга атаясамліваць са зладжаным і нязладжаным гучаннем (*какафоніяй*). Яны адрозніваюцца характарам узаемадзеяння гарманічных спектраў гукаў, што ўтвараюць пэўнае сугучча. Акустычны Д. выяўляецца ў несупадзенні вял. колькасці *абертонаў* гэтых гукаў. Да Д. належаць павялічаныя і паменшаныя *інтэрвалы* — вял. і малыя секунды і септымы, трытон і інш., *акорды*, якія ўключаюць хоць адзін з гэтых інтэрвалаў, і акорды, складзеныя з кансанансаў, калі адзін з верхніх галасоў утварае чыстую кварту з басам (мажорныя і мінорныя квартсекстакорды).

У еўрап. прафес. музыцы 15—19 ст. адрозненне паміж Д. і кансанансам дасягнула ступені вострай процілегласці і стала адной з асноў муз. мыслення. Д. успрымаецца як напружанае і няўстойлівае сугучча, выяўляе імкненне, рух да вырашэння — заканамернага пераходу ў адпаведны кансананс. Да 17 ст. Д. выкарыстоўвалі звычайна ва ўмовах правільнай падрыхтоўкі і вырашэння. У 17—19 ст. Д. страціў прамую залежнасць ад папярэдняга кансанансу, абавязковым засталося толькі яго вырашэнне. У музыцы 20 ст. набывае ўсё большую самастойнасць, у некат. стылях (напр., у кампазітараў нававенскай школы) цалкам выцясняе кансананс, што стала падставай для ўзнікнення тэорый, якія прынцыпова адмаўляюць адрозненні паміж Д. і кансанансам. *А.А.Друкт.*

ДЫСАЦЫЯ́ЦЫЯ (ад лац. dissociatio раз'яднанне, раздзяленне), распад малекул і крышталёў на некалькі больш простых малекул, атамаў, радыкалаў ці іонаў. У залежнасці ад характару ўздзеяння, што выклікае Д., адрозніваюць *электралітычную дысацыяцыю*, тэрмічную і фотадысацыяцыю (Д. пад уздзеяннем іанізавальнага выпрамянення). Колькасная характарыстыка Д. — с т у п е н ь д ы с а ц ы я ц ы і, роўная адносінам колькасці малекул, што распаліся, да агульнай колькасці малекул у сістэме.

ДЫСБАКТЭРЫЁЗ (ад *дыс...* + *бактэрыі* + *...оз*), д ы с м і к р а б і ё з, змена колькасных суадносін і складу нармальнай мікрафлоры арганізма. Характарызуецца знікненнем, зніжэннем ці павелічэннем колькасці пастаянных у ім мікробаў ці з'яўленнем у ім незвычайных бактэрый і грыбоў. Прычыны Д.: няправільнае лячэнне антыбіётыкамі, антысептыкамі, гармонамі, прамянямі, запаленні, зніжэнне мясц. імунітэту тканак, пратэзаванне, прафес. шкоднасці. Найчасцей узнікае пры спалучэнні, сіле і працяглым уздзеянні шкодных фактараў. Адрозніваюць Д. поласці рота, глоткі, носа, кішэчніка, похвы, вільготных участкаў скуры. Бывае грыбковы, стафілакокавы, антэрабактэрыяльны і інш. Лячэнне: ліквідацыя прычыны хваробы, бактэрыяльныя і антымікробныя прэпараты.

ДЫСГАРМО́НІЯ (ад *дыс...* + *гармонія*) у м у з ы ц ы, парушэнне або адсутнасць гармоніі (гл. *Гармонія* ў музыцы), гукавы разлад (у адрозненне ад гарманічна арганізаванага *дысанансу*).

ДЫСГАРМО́НІЯ с е к с у а л ь н а я, агульная назва розных расстройстваў сексуальных узаемаадносін паміж мужчынам і жанчынай (сексуальнымі партнёрамі). Можа праяўляцца ўласна сексуальнымі расстройствамі і парушэннем псіхал. сувязей паміж партнёрамі.

Прычынай з'яўляюцца нярэдка спалучэнне асобаснай і фізічнай неадпаведнасці мужчыны і жанчыны, індывід. адрозненні партнёраў у фіз. і культ. развіцці, асабліва сексуальных паводзін і псіхал. аблічча, наяўнасць у аднаго або абодвух партнёраў уяўных ці сапраўдных сексуальных расстройстваў і інш. Узмацняюць Д. паяўленне новых захапленняў, здрада, алкагольныя эксцэсы. Калі Д. чыста псіхал. характару (без сексуальных парушэнняў), найб. часта парушаюцца *лібіда* (палавая цяга), *эрэкцыі* (у мужчын), радзей развіваецца заўчаснае семявывяржэнне. Лячэнне Д. накіравана на ліквідацыю ўласна сексуальных расстройстваў, правядзенне *псіхатэрапіі* з партнёрамі.

ДЫСГЕНІТАЛІ́ЗМ (ад *дыс...* + лац. genitalis дзетародны, палавы), агульная назва парушэнняў развіцця *палавых органаў*, пры якіх яны маюць празмерна вял. ці малыя памеры. Д. можа мець дачыненне да розных аддзелаў палавых органаў, аднак у плане сексуальных узаемаадносін вядучую ролю адыгрываюць змяненні формы і памераў геніталій (палавога члена, вульвы, похвы, шыйкі *маткі*), дзе ёсць *эрагенныя зоны*. Д. адрозніваюць ад набытых змяненняў формы і велічыні палавых органаў у выніку мех. пашкоджанняў, запаленчых, сасудзістых і інш. захворванняў, пухлін, парушэнняў лімфаадтоку.

ДЫСГІДРО́З (ад *дыс...* + грэч. hidrōs пот + *...оз*), утварэнне на скуры ўнутрыэпідэрмальных пухіркоў з прычыны закупоркі праток потавых залоз. Бывае ў людзей з высокай патлівасцю, пасля нерв. стрэсаў, хваляванняў, сполаху; лічыцца таксама праяўленнем алергічнай рэакцыі. Прыкметы: на скуры далоней, бакавых паверхняў пальцаў рук, на падэшве глыбокія празрыстыя пухіры, пякота ці сверб. Лячэнне: супрацьзапаленчая тэрапія.

ДЫСЕ́КТАР (ад *дыс...* + лац. seco рассякаю), адзін з відаў перадавальных *тэлевізійных трубак* без назапашвання эл. зараду. Мае лінейную залежнасць паміж уваходным (аптычным) і выхадным (эл.) сігналамі, малую інерцыйнасць. Пад уздзеяннем святла фотакатод выпрамяняе паток электронаў, частка якога накіроўваецца ў другаснаэлектронны памнажальнік, узмацняецца і пераўтвараецца на выхадзе Д. ў *відэасігнал*. Выкарыстоўваецца ў прыкладных тэлевізійных сістэмах.

ДЫСЕМІНА́ЦЫЯ (ад *дыс...* + лац. semino рассейваю, рассыпаю), распаўсюджанне ўзбуджальніка інфекц. хваробы з першаснага ачага ці пухлінных клетак з асн. вузла па крывяноснай і лімфатычнай сістэмах у межах аднаго органа ці па ўсім арганізме. За Д. бывае генералізацыя паталаг. працэсу, развіццё новых, часта шматлікіх, ачагоў (метастазаў).

ДЫСЕРТА́ЦЫЯ (ад лац. dissertatio меркаванне, даследаванне), навукова-даследчая праца, падрыхтаваная для публічнай абароны на атрыманне вучонай ступені. Д. на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук павінна выявіць фундаментальныя тэарэт. веды дысертанта ў пэўнай галіне навукі і спец. ве-

ды па пытаннях Д., здольнасць да самаст. навук. даследавання, мець новыя навук. і практычныя вывады. Д. на атрыманне вучонай ступені *доктара навук* павінна мець тэарэт. абагульненні, вырашаць важную навук. праблему, якая з'яўляецца значным укладам у навуку і практыку.

ДЫСІДЭ́НТЫ [ад лац. dissidens (dissidentis) нязгодны, супярэчлівы], 1) вернікі-хрысціяне, якія не прытрымліваюцца пануючага веравызнання, пераважна ў краінах, дзе дзярж. ці пануючай рэлігіяй з'яўляецца каталіцызм або пратэстантызм. У сярэдневяковых краінах Зах. Еўропы каталіцкая царква праследавала Д., лічыла іх «адступнікамі» ад веры, ерэтыкамі. У 16—17 ст. грамадз. правы Д. парушаліся ў сувязі з рэліг. Рэфармацыяй (напр., *гугенотаў* у Францыі, *анабаптыстаў*, *квакераў*, кальвіністаў, лютэран і інш., а з 1596 і праваслаўных у Рэчы Паспалітай). Улады Рэчы Паспалітай у 1616 пазбавілі праваслаўных доступу на сеймы, у 1718 забаранілі дысідэнцкай шляхце займаць пасады ў трыбуналах, камісіях, мясц. урадах; асабліва варожыя дзеянні да Д. праяўлялі *езуіты* (у 17 — 1-й пал. 18 ст. ў праваслаўных адабрана каля 200 цэркваў). Д. часта баранілі свае правы з дапамогай знешніх сіл. У 1767 пад патранажам Прусіі і Расіі ўтвораны Тарунская (пратэстанцкая) і Слуцкая (праваслаўная) канфедэрацыі. У 1768 сейм ураўнаваў у правах Д. з католікамі, аднак гэта праблема ў Рэчы Паспалітай не была поўнасцю вырашана, што давала падставы Расіі для ўмяшання ў справы Рэчы Паспалітай (гл. *Варшаўскі дагавор 1768*). 2) Асобы, якія адкрыта адстойваюць апазіцыйныя ўладам погляды ва ўмовах адсутнасці ў грамадстве рэальнага паліт. плюралізму. Тэрмін замацаваўся ў сярэдзіне 1970-х г. У СССР і інш. сацыяліст. краінах у канцы 1950-х — сярэдзіне 1980-х г. Д. ў розных формах патрабавалі выканання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна (праваабаронцы), пратэставалі супраць уводу сав. войск у Чэхаславакію (1968) і Афганістан (1979). Многія з іх былі асуджаны ўладамі, высланы або вымушаны эмігрыраваць. Сярод найб. вядомых Д. былі У.К.*Букоўскі*, В.*Гавел*, А.І.*Салжаніцын*, А.Дз.*Сахараў*.

Я.К.Анішчанка (дысідэнты ў Рэчы Паспалітай).

ДЫСІМІЛЯ́ЦЫЯ (ад *дыс...* + лат. similis падобны) у біялогіі, працэс, процілеглы *асіміляцыі* тое, што *катабалізм*.

ДЫСІМІЛЯ́ЦЫЯ ў мовазнаўстве, распадабненне ў межах аднаго слова або словазлучэння аднаго з двух артыкуляцыйна блізкіх ці аднолькавых гукаў іншым, менш падобным. Узнікае паміж гукамі аднаго тыпу — галоснымі (вакальная Д.) ці зычнымі (кансанантычная Д.) і звычайна скіравана на аблягчэнне вымаўлення. Бывае Д. сумежных гукаў (кантактная Д., напр., «трахтар» з «трактар») і гукаў, раздзеленых інш. гукамі (дыстактная Д., напр., «більзін» з «бензін»). Адрозніваецца Д. прагрэсіўная (змяненне гука пад уплывам папярэдняга: «пролубка» з «прорубка») і рэгрэсіўная (змяненне гука пад уплывам наступнага: «канбайн» з «камбайн»). Пашырана Д. ў гаворках, прастамоўі, дзіцячым маўленні, сустракаецца ў літ. мове, дзе асобныя яе формы замацаваліся як нарматыўныя: «калідор» з «карыдор» і г.д. Д. процілеглая *асіміляцыі*.

ДЫСІПАТЫ́ЎНЫЯ СІСТЭ́МЫ, механічныя сістэмы, поўная энергія якіх (сума кінетычнай і патэнцыяльнай энергій) у працэсе руху памяншаецца, пераходзячы ў інш. віды энергіі, напр. ва ўнутр. энергію — цеплату (гл. *Дысіпацыя*). Д.с. з'яўляецца кожнае цела ці сістэма цел, што рухаюцца ў рэальным асяроддзі пры наяўнасці сіл трэння, супраціўлення ці вязкасці.

Паняцце «Д.с.» выкарыстоўваецца ў фізіцы і ў дачыненні да немех. сістэм у выпадках, калі энергія ўпарадкаванага працэсу пераходзіць у энергію неўпарадкаванага працэсу, у рэшце рэшт — у энергію хаатычнага (цеплавога) руху малекул. Напр., вагальны контур, у якім адбываюцца затухальныя ваганні з-за наяўнасці амічнага (актыўнага) супраціўлення, з'яўляецца таксама Д.с.; у гэтым выпадку эл. энергія ўпарадкаванага руху электронаў пераходзіць у т. зв. джоўлеву цеплату.

А.І.Болсун.

ДЫСІПА́ЦЫЯ (ад лац. dissipatio рассейванне), 1) Д. энергіі — пераход энергіі ўпарадкаванага руху матэрыяльных аб'ектаў (напр., энергіі мех. руху макрацел, энергіі эл. току) у энергію хаатычнага (цеплавога) руху малекул. 2) Д. атмасферы — паступовае рассейванне газаў атмасферы Зямлі, планет, зорак і інш. у навакольную касм. прастору.

ДЫ́СКА (Disco), самы вялікі востраў у моры Бафіна, каля зах. берагоў Грэнландыі, уладанне Даніі. Пл. 8,6 тыс. км^2. Расчлянёнае, у асноўным базальтавае плато. Выш. да 1919 м. $^1/_5$ вострава ўкрыта ледавікамі. Радовішчы бурага вугалю і жал. руды. Порт Кекертарсуак (Годхаўн).

ДЫСКАВА́ННЕ, дробная апрацоўка глебы на глыб. 5—15 см дыскавымі лушчыльнікамі або баронамі. Тэхналагічны прыём Д. — рыхленне зніжае страты вільгаці на выпарэнне і ўзмацняе яе прыток з ніжэйшых гарызонтаў глебы, знішчае пустазелле, паскарае мінералізацыю раслінных рэшткаў. Д. зніжае шчыльнасць, павышае порыстасць, аэрацыю глебы. У сістэме зяблевага ворыва шырока выкарыстоўваецца для папярочнага разроблівання пластоў пасля ўзворвання цаліны, дзярніны шматгадовых траў, малапрадукцыйных лугоў і пашы, выраўноўвання камлыжыстай раллі, перадпасяўной апрацоўкі азімых і яравых культур.

Л.В.Круглоў.

«ДЫСКА́ВЕРЫ» (Discovery), гл. *«Спэйс Шатл»*.

ДЫСКАМІЦЭ́ТЫ (Discomicetes), група парадкаў сумчатых грыбоў падкласа эўаскаміцэтаў. Вядома каля 6 тыс. відаў з 6 парадкаў. Пашыраны па ўсім зямным шары. На Беларусі 44 віды з парадкаў *гелацыяльныя*, *пецыцыяльныя*, *труфелевыя*, *фацыдыяльныя*. Сапратрофы, актыўныя разбуральнікі раслінных рэшткаў. Мікарызаўтваральнікі. Ёсць паразіты раслін (напр., склератынія). Ядомыя смаржок, страчок, труфелі.

Пладовыя целы (апатэцыі) з раскрытым адразу або ў стадыі спёласці гіменіем, які знаходзіцца пераважна на ўвагнутай паверхні (дыску); сядзячыя ці на ножках, часта яркa афарбаваныя (чырвоныя, жоўтыя, аранжавыя і інш.), ад амаль непрыкметных да буйных (да 26 см). Марфал. асаблівасці апатэцыяў — важная таксанамічная прыкмета. Сумкі большасці Д. выцягнута-авальныя, перамяжоўваюцца з простымі ці разгалінаванымі парафізамі (стэрыльныя ніткі). Сумкаспоры пераважна аднаклетачныя.

ДЫ́СКАНТ (ад *дыс...* + лат. cantus спеў), 1) від шматгалосся 12—15 ст. Першапачаткова тэрмін абазначаў 2-галоссе ў сінхронным рытме («нота супраць ноты») і пераважна з супрацьлеглым рухам галасоў. 2) Высокі дзіцячы пеўчы голас з дыяпазонам c^1—a^2, а таксама яго партыя ў хоры ці вак. ансамблі. 3) Верхні голас у 4-галосым выкладанні (тое, што *сапрана*). 4) Дышкант — высокі саліруючы голас у данскіх казацкіх песнях і песнях усх. абласцей Украіны і Беларусі (наз. таксама *падводка*, гаравік). 5) У 16—17 ст. назва самага высокага інструмента ў сям'і (напр., Д.-віёла, Д.-трамбон і інш.). 6) Арганны рэгістр.

ДЫСКАТЭ́КА (ад грэч. diskos дыск + thēkē умяшчальня, сховішча), 1) збор грамафонных пласцінак (дыскаў). 2) Маладзёжная танцавальна-забаўляльная ўстанова, дзе музыка і танцы суправаджаюцца, як правіла, каментарыямі дыск-жакея.

ДЫСКЕ́ТА (англ. diskette), носьбіт інфармацыі ў персанальных ЭВМ; тонкі гнуткі пластмасавы дыск, пакрыты магн. слоем з аднаго ці з абодвух бакоў. Выкарыстоўваецца ў якасці знешняй памяці прамога доступу. Гл. таксама *Магнітны дыск*.

ДЫСКО́НТ (англ. discount), 1) спагнанне банкам пэўнай часткі намінальнага кошту вэксаляў, чэкаў, інш. каштоўных папер у выпадку скупкі іх да тэрміну пагашэння. 2) Працэнт ад кошту вэксаля, які спаганяецца пры набыцці яго да тэрміну пагашэння. Памер Д. залежыць ад дысконтнай (уліковай) стаўкі, намінальнага кошту і тэрміну пагашэння. Гл. *Дысконтная палітыка*.

ДЫСКО́НТНАЯ ПАЛІ́ТЫКА, адна з асноўных (з *дэвізнай палітыкай*) форм ажыццяўлення валютнай палітыкі дзяржавы. Праводзіцца шляхам павышэння або паніжэння ўліковай стаўкі з мэтай уздзеяння на аб'ём крэдыту ў краіне,

тэмп інфляцыі, а таксама стан плацежнага балансу і валютны курс і ў выніку на эканоміку ў цэлым.

ДЫСКРЫМІНА́НТ [ад лац. discriminans (discriminantis) які распазнае, раздзяляе] алгебраічнага ўраўнення, выраз, які складаецца з каэфіцыентаў ураўнення і ператвараецца ў нуль у тым і толькі ў тым выпадку, калі сярод каранёў ураўнення ёсць роўныя. Напр., Д. квадратнага ўраўнення $x^2+px+q=0$ роўны p^2-4q, кубічнага ўраўнення $x^3+px+q=0$ роўны $-4p^3-27q^2$.

ДЫСКРЫМІНА́ТАР (ад лац. discrimino раздзяляю), электроннае прыстасаванне для пераўтварэння змяненняў параметраў (частаты, фазы, амплітуды, працягласці) эл. сігналаў у сігнал разузгаднення. Адрозніваюць Д. фазавыя, частотныя, часавыя і амплітудныя. Лікавае значэнне і палярнасць напружання разузгаднення вызначаюцца па адхіленні параметра ўваходнага сігналу ад такога ж параметра эталоннага сігналу. Выкарыстоўваюцца ў сістэмах аўтам. рэгулявання сродкаў аўтаматыкі і тэлемеханікі, у частотных і фазавых дэтэктарах радыё- і тэлепрыёмнікаў, прыладах ядз. фізікі і інш.

ДЫСКРЫМІНА́ЦЫЯ (ад лац. discriminatio адрозніванне), абмежаванне або пазбаўленне грамадзянскіх, паліт. і інш. правоў і свабод з-за нац., расавай прыналежнасці, полу, веравызнання, паліт. поглядаў і г.д. У гісторыі краін свету Д. практыкавалася даволі часта. Адначасова дэмакр. сілы вялі барацьбу супраць Д. У ЗША вынікам Грамадз. вайны паміж Поўначчу і Поўднем 1861—65 было абвяшчэнне раўнапраўя неграў і яго юрыд. замацаванне ў форме папраўак да Канстытуцыі. Прыкладамі жорсткай Д. шматлікіх груп грамадзян на глебе *расізму* былі Германія (1933—45), Радэзія і Паўд.-Афрыканская Рэспубліка, дзе расісцкі рэжым праіснаваў да пач. 1990-х г. (гл. *Апартэід*). Міждзярж. супрацоўніцтва для пераадолення Д. і абароны асн. правоў чалавека і грамадзяніна прывяло да афіц. асуджэння дыскрымінацыйнай практыкі на дзярж. узроўні і скасавання адкрыта дыскрымінацыйных заканад. актаў. Найб. агульныя антыдыскрымінацыйныя прынцыпы сфармуляваны ў Дэкларацыі правоў чалавека 1948. Пашыранымі відамі Д. з'яўляюцца пазбаўленне выбарчых правоў, звальненне з работы, адмова ў грамадзянстве ці візе на ўезд або выезд, ушчамленне правоў бежанцаў, імігрантаў і інш. Асаблівае месца займае Д. жанчын у прац., паліт. і інш. грамадскай дзейнасці. У міжнар. адносінах Д. азначае абмежаванне суверэннай роўнасці пэўных дзяржаў як суб'екта міжнар. права шляхам выкарыстання інш. дзяржавамі эканам. і паліт. мер, якія не адпавядаюць агульнапрызнаным прынцыпам міжнар. адносін. Праявай дыскрымінацыйнай палітыкі з'яўляецца стварэнне дзяржавамі закрытых арг-цый з мэтай абароны сваіх рынкаў ад тавараў інш. дзяржаў, свабоднага перамяшчэння працоўнай сілы і г.д. Праблема ўсебаковага пераадолення Д. ва ўсіх галінах міжнар. і грамадскага жыцця пакуль застаецца адной з глабальных праблем сучаснага чалавецтва.

В.І.Боўш.

ДЫСКРЭ́ТНАСЦЬ (ад лац. discretus раздзелены, перарывісты), раздзеленасць, перарыўнасць у прасторы і часе; процілегласць неперарыўнасці. Напр., сістэма цэлых лікаў (у процілегласць сістэме рэчаісных лікаў) — дыскрэтная. У фізіцы Д. азначае перарыўнасць будовы матэрыі (яе атамістычнасць), а таксама перарыўны квантавы характар працэсаў паглынання і выпрамянення энергіі ў атамах і малекулах. Д. некат. фіз. велічыні — змяненне яе значэнняў, што адбываюцца праз пэўныя прамежкі часу (скачкамі). Гл. таксама *Неперарыўнасць і перарыўнасць*.

ДЫСКРЭ́ТНАЯ МАТЭМА́ТЫКА, раздзел матэматыкі, які вывучае ўласцівасці дыскрэтных структур (гл. *Дыскрэтнасць*). Частка Д.м., якая вывучае канечныя структуры (напр., канечныя групы, графы, машыны Цюрынга), наз. канечнай матэматыкай. У пашыраным сэнсе Д.м. падзяляецца на тэорыю лікаў, выліч. матэматыку, матэм. логіку, камбінаторны аналіз, а таксама новыя кірункі даследаванняў — тэорыю графаў, тэорыю кадзіравання, цэлалікавае праграмаванне, тэорыю аўтаматаў, раскладаў, ЭВМ, праграмавання і інш., у якіх аб'екты даследаванняў маюць дыскрэтны характар.

Элементы Д.м. ўзніклі ў глыбокай старажытнасці і развіваліся паралельна з інш. раздзеламі матэматыкі. Напр., тагачасныя тыповыя задачы, звязаныя з уласцівасцямі цэлых лікаў (вытокі *лікаў тэорыі*): адшуканне алгарытмаў складання і множання натуральных лікаў (Егіпет, 2-е тыс. да н.э.), задачы падсумавання і падзельнасці натуральных лікаў у піфагарэйскай школе (6 ст. да н.э.). На практыцы найчасцей адначасова прысутнічаюць уласцівасці неперарыўнасці і дыскрэтнасці, канечнасці і бясконцасці; пры рашэнні канкрэтных задач шырока выкарыстоўваецца прыём замены неперарыўнай мадэлі яе дыскрэтным аналагам. У Д.м. разам з пабудовай алгарытмаў рашэння асобных задач выяўляюцца пытанні алгарытмічнай вырашальнасці, ацэнкі вылічальнай складанасці алгарытмаў, выяўлення цяжкавырашальных задач і інш.

На Беларусі даследаванні па пытаннях Д.м. распачаты ў канцы 1950-х г. па ініцыятыве акад. Дз.А.*Супруненкі* і вядуцца ў Ін-тах матэматыкі і тэхн. кібернетыкі Нац. АН і БДУ.

Літ.: Яблонский С.В. Введение в дискретную математику. М., 1979; Рейнгольд Э., Нивергельт Ю., Део Н. Комбинаторные алгоритмы: Теория и практика: Пер. с англ. М., 1980; Пападимитриу Х.Х., Стайглиц К. Комбинаторная оптимизация: Алгоритмы и сложность: Пер. с англ. М., 1985.

В.С.Танаеў.

ДЫСКРЭ́ТНАЯ СІСТЭ́МА, тэхнічная (электронная ці інш.) сістэма, працэс функцыянавання якой характарызуецца канечным (ці бясконцым) дыскрэтным наборам станаў, змены якіх могуць адбывацца ў дыскрэтныя моманты часу (гл. *Дыскрэтнасць*). Напр., паслядоўнасць выпрабаванняў з некалькімі магчымымі зыходамі. Пры гэтым ролю часу выконвае нумар выпрабавання, ролю стану — нумар зыходу. Існуюць неперарыўныя сістэмы, якія таксама можна разглядаць як дыскрэтныя (напр., лічбавыя вымяральныя прылады): станы ўлічваюцца ў пэўныя (дыскрэтныя) моманты часу і іх лікавыя значэнні акругляюцца. Апісанне і даследаванне Д.с. выконваецца з дапамогай дыскрэтных *Маркава ланцугоў*, рознасных ураўненняў, стахастычных матрыц і інш. Пашыраны Д.с. аўтам. кіравання (гл. *Аўтаматычнага кіравання тэорыя*), апрацоўкі інфармацыі на ЭВМ, а таксама лічбавыя элементы выліч. тэхнікі, лічбавыя інтэгральныя схемы і інш. На Беларусі пытанні аналізу, сінтэзу, аўтаматызацыі праектавання Д.с. распрацоўваюць у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН, БДУ, Бел. дзярж. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, НВА «Інтэграл» і інш.

М.П.Савік.

ДЫСКУ́СІЯ (ад лац. discussio разгляд, даследаванне), публічнае абмеркаванне якога-н. спрэчнага пытання; спрэчка асобных субяседнікаў.

ДЫСЛАКА́ЦЫІ (ад позналац. dislocatio зрушэнне, перамяшчэнне) ў геалогіі, парушэнні залягання горных парод у зямной кары і на яе паверхні. Адбываюцца ў выніку ўнутрызямных (эндагенных) працэсаў: тэктанічных, магматычных, вулканічных, метамарфічных, гідрастатычнага выштурхоўвання, гравітацыйнага пераразмеркавання парод па шчыльнасці і пластычнасці; паверхневых (экзагенных) працэсаў: крыягенных (звязаных са шматгадовай мерзлатой), гляцыягенных (ледавіковых), эразійных (дзейнасці акіянаў, мораў, рэк, азёр, вадасховішчаў і інш.), гравітацыйных (апоўзні, дэлювіяльна-пралювіяльныя перамяшчэнні), выціскання пластычных парод, карставых, саліфлюкцыйных (апаўзанне глеб на схілах стромкасцю больш за 3°—5°), дзейнасці ветру, тэхнагенных. Істотна ўплываюць на Д. і касм. працэсы: вярчэнне Зямлі, месячныя і сонечныя прылівы і адлівы, а таксама ўздзеянне інш. касм. цел. У выніку Д. адбываюцца дэфармацыі горных парод. *У.І.Шкуратаў.*

ДЫСЛАКА́ЦЫІ ў крышталях, трансляцыйныя лінейныя *дэфекты ў крышталях*; лініі, уздоўж і паблізу якіх парушана рэгулярнае размяшчэнне атамных плоскасцей. Могуць выходзіць на паверхню, замыкацца (утвараць дыслакацыйную пятлю), разгаліноўвацца, не абрываюцца ўнутры крышталя. Сярэдняя колькасць ліній Д., што праходзяць праз сячэнне адзінкавай плошчы, вызначае дыслакацыйную шчыльнасць.

У простай кубічнай рашотцы бываюць 2 тыпы Д. — краявая і вінтавая; у больш складаных структурах паміж гэтымі граничнымі тыпамі могуць існаваць прамежкавыя (напр.,

у рашотцы алмазу бывае 10 тыпаў Д.). **Краявыя Д.** — лініі, уздоўж якіх унутры крышталя абрываецца край лішняй атамнай паўплоскасці. **Вінтавыя Д.** ўтвараюцца ў выніку зруху на перыяд рашоткі адной часткі крышталя адносна другой уздоўж некаторай атамнай паўплоскасці паралельна яе краю. Пры абходзе вакол лініі Д. па вузлах рашоткі ўзнікае незамкнёнасць контуру, якая характарызуецца вектарам Бюргерса $\vec{b}$. Даўжыня вектара $\vec{b}$ роўная аднаму з трансляцыйных перыядаў рашоткі, а напрамак залежыць ад напрамку абходу контуру. Для краявой Д. вектар датычнай L да яе лініі і вектар $\vec{b}$ перпендыкулярныя, для вінтавой — паралельныя. Існуюць 2 спосабы перамяшчэння Д. па крышталі: слізганне (абумоўлена разрывам і перазлучэннем міжатамных сувязей уздоўж лініі Д.) і перапаўзанне (атамная рэканструкцыя краю лішняй паўплоскасці). У рэальных крышталях Д.— ломаныя лініі, якія складаюцца з участкаў (сегментаў) розных тыпаў. Пры збліжэнні двух Д. аднатыпныя сегменты з паралельнымі вектарамі Бюргерса адштурхоўваюцца, а з антыпаралельнымі — прыцягваюцца, і адбываецца «анігіляцыя» сегментаў. Узнікненне Д. абумоўлена пластычнай дэфармацыяй крышталя ў працэсе яго росту або далейшых тэрмаапрацовак. Д. ў крышталі знаходзіцца ў полі пругкіх напружанняў. Пры павелічэнні пластычнай дэфармацыі расце колькасць Д., іх палі перакрываюцца і слізганне ўскладняецца (дэфармацыйнае ўмацаванне). Рух і ўзаемадзеянне Д. вызначаюць змяненне формы крышталя і яго ўласцівасцей. У кавалентных крышталях (германій, крэмній, алмаз) Д. маюць абарваныя хім. сувязі; кожная разарваная (ненасычаная) сувязь можа выступаць як цэнтр захопу электрона. У кавалентных і іонных крышталях Д. праяўляюць сябе ў фотапругкасці, люмінесцэнцыі, анізатрапіі электраправоднасці і інш. Акрамя Д. у крышталях бываюць ратацыйныя лінейныя дэфекты — дысклінацыі (парушэнні сіметрыі напрамкаў).

Літ.: Судзуки Т., Ёсинага Х., Такеути С. Динамика дислокаций и пластичность: Пер. с яп. М., 1989; Дроздов Н.А., Патрин А.А., Ткачев В.Д. Рекомбинационное излучение на дислокациях в кремнии // Письма в Журн. экспер. и теорет. физики. 1976. Т. 23, № 11.

М.А.Драздоў, М.А.Паклонскі.



Дыслакацыі: 1 — краявая; 2 — вінтавая.

ДЫСЛАКА́ЦЫЯ ваенная, размяшчэнне (раскватараванне) сухапутных войск і ваен. устаноў у мірны час у адведзеных для іх месцах (ваен. гарадках, лагерах і інш.); размяшчэнне вайсковых часцей і злучэнняў на фронце, злучэнняў ВПС па аэрадромах базіравання, караблёў ВМФ па партах для пастаяннага базіравання або на зімовы час. Пры Д. бярэцца пад увагу неабходнасць забеспячэння ўзбр. сіламі аховы інтарэсаў краіны на выпадак вайны.

ДЫСЛАЛІ́Я (ад *дыс...* + грэч. lalia мова), тое, што *коснаязыкасць*.

ДЫСМАРФАМА́НІЯ (ад *дыс...* + *марфа...* + *манія*), псіхічнае расстройства, якое выяўляецца хваравітай упэўненасцю ў наяўнасці выдуманай фіз. заганы. Уласціва пераважна падлеткавазму ўзросту (як і *дысмарфафабія*) і тычыцца бачных участкаў цела, фігуры і палавых органаў. Часцей праяўляецца ў выглядзе звышцэнных ідэй або трызнення, звычайна суправаджаецца стараннай маскіроўкай сваіх перажыванняў, імкненнем да выпраўлення выдуманага дэфекту любым шляхам. Пры гэтым магчымы імкненне да самагубства, самапашкоджанне, розныя віды самалячэння.

ДЫСМАРФАФАБІ́Я (ад *дыс...* + *марфа...* + *фобія*), назойлівы неўратычны страх, звязаны з рэальнай або ўяўнай фіз. заганай. У адрозненне ад *дысмарфаманіі* працякае звычайна без цяжкіх псіх. расстройстваў. Праяўляецца пераважна ў падлеткаў як часовая ўзроставая з'ява; большасць выпадкаў Д. прыпадае на перыяд палавога выспявання (хоць можа развівацца і ў дарослых людзей, зрэдку і ў дзяцей).

ДЫСМЕНАРЭ́Я (ад *дыс...* + грэч. mēn месяц + rheō цяку), агульная назва расстройстваў менструальнага цыкла. Гл. таксама *Альгадысменарэя*.

ДЫСМІКРАБІЁЗ, гл. *Дысбактэрыёз*.

ДЫ́СНЕЙ (Disney) Уолт (Эліяс Уолтэр; 15.12.1901, г. Чыкага, ЗША — 15.12.1966), амерыканскі кінарэжысёр, мастак, прадзюсер. Вучыўся ў Акадэміі прыгожых мастацтваў у Чыкага. У 1919—22 працаваў мастаком, з 1923 у Галівудзе. Здымаў кароткаметражныя мультфільмы з пастаяннымі персанажамі Алісай (1923—26) і Освальдам (1926—28), гукавыя (з 1928) пра мышаня Мікі Маўса і качаня Дональда Дака, поўнаметражныя фільмы «Беласнежка і сем гномаў» (1938), «Піноккіо» (1939), «Бэмбі» (1942), «Аліса ў краіне цудаў» (1951), «Спячая прыгажуня» (1958), «Мэры Попінс» (1965, засн. на сумяшчэнні акцёра і мультыплікацыі). З 1950 таксама прадзюсер дакумент. і маст. фільмаў, у т.л. для тэлебачання. Атрымаў 29 прэмій «Оскар». У 1955 у г. Анахайм (Каліфорнія) адкрыў буйны тэматычны забаўляльны дзіцячы парк «Дыснейленд», дзе шэраг атракцыёнаў узнаўляе вобразы яго фільмаў.

ДЫСПАЗІТЫ́ЎНАСЦЬ (ад лац. dispositivus які распараджаецца), у цывільным працэсе магчымасць для розных удзельнікаў справы свабодна распараджацца сваімі матэрыяльнымі і працэсуальнымі правамі. Суд садзейнічае ім у рэалізацыі гэтых правоў і ажыццяўляе кантроль за законнасцю іх распарадчых дзеянняў: з мэтай аказання падтрымкі бакам і інш. удзельнікам справы, паколькі юрыд. недасведчанасць і інш. акалічнасці могуць ускладніць належную абарону імі сваіх правоў і інтарэсаў, і каб прадухіліць злоўжыванне ўдзельнікамі справы іх правамі.

ДЫСПАЗІ́ЦЫЯ (ад лац. dispositio размяшчэнне), 1) у ваен. справе да 20 ст. назва плана размяшчэння сухапутных войск для вядзення бою. У 18—19 ст. пісьмовы загад войскам, у якім ставіліся баявыя задачы; у 1912 у рус. арміі Д. заменена паняццем «баявы загад». 2) У ВМФ размяшчэнне караблёў на рэйдзе, базах, стаянках у адкрытым моры. 3) У праве састаўная ч. *нормы права*, што вызначае правілы паводзін, правы і абавязкі, якімі надзяляюцца ўдзельнікі праваадносін.

ДЫСПАНСЕ́Р (франц. dispensaire ад лац. dispenso размяркоўваю), лячэбна-прафілакт. ўстанова, аснова дзейнасці якой — ранняе выяўленне і лячэнне хворых, дынамічны нагляд і ажыццяўленне сан.-аздараўленчых мерапрыемстваў (гл. *Дыспансерызацыя*). На Беларусі першы (процітуберкулёзны) Д. адкрыты ў 1921 у Мінску. Папярэднікамі Д. (Мінск, Бабруйск) былі процітуберкулёзныя амбулаторыі (1910—11). На пач. 1997 у рэспубліцы дзейнічаюць Д.: процітуберкулёзныя (30), анкалагічныя (11), скурна-венералагічныя (34), псіханеўралагічныя (13), процівалляковыя (6), урачэбна-фізкульт. (10), наркалагічныя (11), кардыялагічныя (5), 2 спец. Д. для хворых пасля радыяцыйнага ўздзеяння ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

ДЫСПАНСЕРЫЗА́ЦЫЯ, метад дынамічнага назірання за станам здароўя насельніцтва, які ўключае комплекс прафілакт., дыягнастычных і лячэбна-аздараўленчых мерапрыемстваў. Ажыццяўляецца *дыспансерамі* для ўмацавання здароўя і захавання працаздольнасці насельніцтва. Уключае пастаянны нагляд за станам здароўя асоб, якія знаходзяцца на дыспансерным уліку, вывучэнне і аздараўленне ўмоў іх працы і быту, выяўленне і лячэнне хворых на пач. стадыях хвароб, правядзенне індывідуальнай і сац. прафілактыкі.

Адрозніваюць 2 формы Д.: здаровых асоб (дзеці, падлеткі, цяжарныя, спартсмены) і хворых (хваробы сардэчна-сасудзістай сістэмы, язвавая хвароба, цукр. дыябет, новаўтварэнні і інш.). На Беларусі ўведзена ў 1919—21 як спосаб

работы ўстаноў аховы маці і дзіцяці, з 1925—27 — прамысл. рабочых.

Літ.: Демченкова Г.З., Полонский М.Л. Теоретические и организационные основы диспансеризации населения. М., 1987.

Э.А.Вальчук.

ДЫСПЕПСІ́Я (ад *дыс*... + грэч. pepsis страваванне), парушэнні страваванне. Тэрмін «Д.» захаваўся пераважна для вызначэння сіндромаў парушэння функцыі кішэчніка — гніласная Д. і брадзільная Д. У аснове брадзільнай Д. ляжыць павышаная маторыка тонкага кішэчніка. У выніку частка вугляводаў ежы не ператраўляецца і не засвойваецца. Праяўляецца ўздуццем і распіраннем жывата, бурчаннем і пераліваннем, колікападобнымі болямі, газамі, вадкім ці кашкападобным стулам. Гніласная Д. — вынік гнення ў тоўстым і часткова тонкім кішэчніку. Праяўляецца паносамі (вадкія, цёмнага колеру, непрыемнага паху). Д. дзіцячая — вострая хвароба страваальна-кішачнага тракту з расстройствам страваванне ў дзяцей першага года жыцця (8—9 месяцаў). Найчасцей бывае пры штучным і мяшаным кармленні. Пры простай Д. стул вадкі, часты, зялёнага колеру з камячкамі (6—8 разоў за суткі), уздуцце жывата, колікападобныя болі. Таксічная Д. — цяжкая форма захворвання з глыбокім парушэннем усіх відаў абмену рэчываў і функцый многіх органаў і сістэм. Праяўляецца рвотай і вадзяністым (да 15 разоў за суткі) стулам. Ад вял. страты вады змяншаецца маса цела, развіваецца эксікоз (абязводжванне), назапашваюцца таксічныя прадукты абмену, што пашкоджвае цэнтр. нерв., вегетатыўную, сардэчна-сасудзістую сістэмы, парушае кровазварот, дыханне, функцыі печані і нырак. Бывае ў аслабленых, хворых на *дыятэз* і *дыстрафію* дзяцей. Лячэнне: водна-чайная дыета, дазіраванае харчаванне, ферменты, вітаміны, антыбіётыкі, сімптаматычныя сродкі.

Р.У.Дэрфліо.

ДЫСПЕРГАВА́ННЕ (ад лац. dispergo рассейваю, рассыпаю), тонкае *здрабненне* цвёрдых цел або вадкасцей, у выніку якога ўтвараюцца *дысперсныя сістэмы* (парашкі, суспензіі, эмульсіі, аэразолі). Д. вадкасці ў газавым асяроддзі (паветры) звычайна называецца распыленнем, у іншай вадкасці (якая не змешваецца з першай) — эмульгаваннем.

Д. цвёрдых цел робяць з дапамогай млыноў тонкага здрабнення (шаравых, вібрацыйных, калоідных, струменных і інш.), гукавых і ультрагукавых ваганняў; пры Д. вадкасцей выкарыстоўваюць таксама турбулентнае (віхравое) перамешванне, розныя гомагенізатары. Д. больш эфектыўнае ў прысутнасці павярхнева-актыўных рэчываў — дыспергатараў і эмульгатараў. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці цэментаў, напаўняльнікаў, фарбавальнікаў, пігментаў, харч. прадуктаў, лекавых прэпаратаў, пры спальванні вадкага і цвёрдага паліва і інш.

ДЫСПЕРСІ́ЙНЫ АНА́ЛІЗ у матэматычнай статыстыцы, статыстычны метад ацэнкі ўплыву асобных фактараў на вынікі эксперымента. Прапанаваны ў 1925 англ. статыстыкам Р.Фішэрам для апрацоўкі вынікаў аграномічных эксперыментаў па выяўленні ўмоў, якія забяспечваюць найб. ўраджай дадзенай культуры. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці (напр., параўнанне розных тэхналогій), аграхім. доследах (выяўленне ўплыву розных угнаенняў, спосабаў апрацоўкі глебы, сартоў насення на ўраджайнасць культуры), эканам. і сац. мерапрыемствах і інш.

Задача Д.а. — выявіць фактары, якія выклікаюць найб. зменлівасць ацэнак сярэдніх значэнняў велічынь, што назіраюцца ў працэсе эксперымента. Напр., у выніку эксперыментаў атрыманы вымярэнні x_{ij}, дзе $i = 1, 2, ..., m$ — нумар групы вымярэнняў, $j = 1, 2, ..., n$ — нумар вымярэння ў кожнай групе, і сярэдняе значэнне $\bar{x}_i$ у кожнай групе роўна

$$\bar{x}_i = \frac{1}{n_i}\sum_{j=1}^{n} x_j ,$$

а агульнае сярэдняе $\bar{x}$ для дадзенай сукупнасці mn вымярэнняў

$$\bar{x} = \frac{1}{mn}\sum_{i=1}^{m}\sum_{j=1}^{n} x_{ij} .$$

У аснову Д.а. закладзена сцвярджэнне, што *дысперсію* $D(x)$ для любой выпадковай велічыні x, якая мае нармальнае размеркаванне і нулявое сярэдняе значэнне, можна запісаць як суму $D(x) = D_1(x) + D_2(x)$, дзе $D_1(x)$ — сярэдняе арыфм. дысперсій адхіленняў значэнняў велічынь x_{ij} ад сярэдняга $\bar{x}_i$ у кожнай групе, $D_2(x)$ — дысперсія адхіленняў сярэдніх $\bar{x}_i$ у групах ад агульнага сярэдняга $\bar{x}$. Па спец. табліцах на аснове атрыманых значэнняў вызначаецца ўплыў фактараў на вынікі эксперыментаў.

В.С.Канчак.

ДЫСПЕРСІ́ЙНЫЯ СУАДНО́СІНЫ, суадносіны паміж велічынямі, што характарызуюць рэакцыю (водгук) фіз. сістэмы на знешняе ўздзеянне. Д.с. не залежаць ад канкрэтнага механізму ўзаемадзеяння сістэмы са знешнім уздзеяннем і з'яўляюцца вынікам *прычыннасці прынцыпу*.

У оптыцы Д.с. звязваюць рэчаісную і ўяўную часткі дыэлектрычнай (магнітнай) пранікальнасці асяроддзя, у квантавай тэорыі поля — рэчаісныя і ўяўныя часткі амплітуд працэсаў узаемадзеяння паміж элементарнымі часцінкамі. Д.с. ўпершыню атрыманы ў тэорыі дысперсіі святла (гл. *Дысперсія хваль*) галанд. фізікам Р.Кронігам (1926) і англ. фізікам Х.Крамерсам (1927; суадносіны Крамерса—Кроніга). Першыя доказы Д.с. для пі-мезон-нуклоннага рассеяння дадзены М.М.*Багалюбавым* (1956). На аснове Д.с. вырашаны многія прынцыповыя пытанні оптыкі, электрадынамікі, фізікі эл. і магн. з'яў, ядз. фізікі і фізікі элементарных часцінак.

У Беларусі даследаванні па выкарыстанні Д.с. у фізіцы элементарных часцінак праводзяцца з 1964 у Ін-це фізікі Нац. АН, БДУ і Гомельскім ун-це.

Літ.: Туров Е.А. Материальные уравнения электродинамики. М., 1983; Нуссенцвейг Х.М. Причинность и дисперсионные соотношения: Пер. с англ. М., 1976; Максименко Н.В., Мороз Л.Г. Феноменологическое описание поляризуемостей элементарных частиц в полевой теории // XI Междунар. школа молодых ученых по физике высоких энергий и релятивистской ядерной физике. Дубна, 1979.

Л.Р.Мороз.

ДЫСПЕРСІ́ЙНЫЯ ФІ́ЛЬТРЫ, аптычныя прылады, якія прапускаюць параўнальна вузкі ўчастак спектра выпрамянення і прынцып дзеяння якіх заснаваны на выбіральным рассеянні святла. Існуюць Д.ф. з кампанентаў крышталь—вадкасць, крышталь—паветра, а таксама з розных крышт. матэрыялаў, палімераў і інш.

Паказчыкі пераламлення 2 кампанентаў Д. ф. аднолькавыя для некаторай частаты святла ω_0, таму пасля праходжання праз такую сістэму святло становіцца амаль монахраматычным (частата, блізкая да ω_0). Светлавыя пучкі іншых частот ($\omega \neq \omega_0$) рассейваюцца. На Беларусі ў 1970-я г. ў Ін-це фізікі АН пад кіраўніцтвам М.А.Барысевіча распрацаваны Д. ф., двума кампанентамі якіх з'яўляюцца крышт. матэрыялы або палімеры. Д.ф. крышталь—крышталь маюць высокую мех. трываласць і кантрастнасць; спектральныя характарыстыкі ў іх стабільныя ў шырокім інтэрвале т-р, адсутнічаюць пабочныя палосы прапускання, параўнальна простая тэхналогія вырабу. Выкарыстоўваюцца ў спектраскапіі, квантавай электроніцы, плазмавай фотаметрыі, піраметрыі, біялогіі, медыцыне, астрафізіцы, метэаралогіі.

Літ.: Борисевич Н.А., Верещагин В.Г., Валидов М.А. Инфракрасные фильтры. Мн., 1971; Верещагин В.Г. Рассеяние излучения в средах с высокой объемной концентрацией // Распространение света в дисперсной среде. Мн., 1982.

В.Р.Верашчагін.

ДЫСПЕ́РСІЯ (ад лац. dispersio рассейванне) у матэматыцы, мера адхілення (рассейвання, роскіду) магчымых значэнняў выпадковай велічыні ад яе сярэдняга значэння. Квадратны корань з Д. наз. сярэднім *квадратычным адхіленнем*.

Асн. ўласцівасці: Д. пастаяннай велічыні роўная нулю; Д. не зменіцца, калі да выпадковай велічыні дадаць пастаянную; Д. сумы незалежных велічынь роўная суме іх Д. і інш. У тэорыі імавернасцей Д. выпадковай велічыні X — матэм. чаканне $D(X) = M(X-MX)^2$ квадрата адхілення X ад яе матэм. чакання MX. Калі X мае функцыю размеркавання $F(X)$, то яе Д. $D(X) = \int_{-\infty}^{\infty} (X-MX)^2 dF(X)$. У матэм. статыстыцы Д. — сярэдняе арыфм. $D(x) = \frac{1}{n}\sum_{i=1}^{n} i\,(x_i - \bar{x})^2$ з квадратаў адхіленняў велічынь x_i ад іх сярэдняга арыфм. $\bar{x} = (x_1+x_2+...x_n) / n$.

М.П.Савік.

ДЫСПЕ́РСІЯ дыфракцыйнай рашоткі, здольнасць *дыфракцыйнай рашоткі* (або інш. спектральнай прылады) раздзяляць у прасторы прамяні розных даўжынь хваль. Лінейная (вуглавая) Д. вызначаецца па формуле $De(\varphi) = \Delta x / \Delta\lambda$, дзе Δx — лінейная (вуглавая) адлегласць паміж спектральнымі лініямі, якія адрозніваюцца па даўжыні хвалі на $\Delta\lambda$. Пры невял. вуглах $D\varphi = m / d$, дзе m — парадак спектра, d — перыяд дыфракцыйнай рашоткі.

ДЫСПЕ́РСІЯ ХВАЛЬ, залежнасць *фазавай скорасці* распаўсюджвання монахраматычных хваль у рэчыве (або паказчыка пераламлення рэчыва) ад частаты іх ваганняў. Назіраецца для хваль любой прыроды, у т.л. пры распаўсюджванні хваль у накіроўных сістэмах (напр., хваляводах); вядзе да скажэння формы сігналу (напр., гукавога імпульсу) пры распаўсюджванні ў асяроддзі; хвалі розных частот на мяжы двух асяроддзяў пераламляюцца па-рознаму і інш. На Д.х. заснаваны прынцыпы дзеяння многіх радыётэхн., аптычных і інш. прылад: спектральных, рэфрактометраў, антэн з частотным сканіраваннем дыяграм накіраванасці і інш.

Д.х. абумоўлена спазненнем водуку асяроддзя пры ўзаемадзеянні яго з пераменным (у часе) полем хвалі; канкрэтны выгляд дысперсійнай залежнасці для розных тыпаў хваль розны і можа быць знойдзены на аснове квантава-мех. даследаванняў працэсу ўзаемадзеяння поля хвалі з часцінкамі асяроддзя. Д.х. суправаджаецца паглынаннем, пры гэтым вызначана інтэгральная сувязь паміж паказчыкам пераламлення і каэфіцыентам паглынання як функцыямі частаты (суадносіны Крамерса—Кроніга). Адрозніваюць Д.х. нармальную (удалечыні ад вобласці паглынання асяроддзя) і анамальную (у межах гэтай вобласці). Звычайна назіраецца дадатная Д.х. (у нармальнай вобласці паказчык пераламлення расце з ростам частаты, у анамальнай — спадае). Пры асаблівых умовах, калі значная частка атамаў рэчыва знаходзіцца ва ўзбуджаным стане, узнікае адмоўная Д.х.: па-за вобласцю паглынання паказчык пераламлення спадае, унутры — расце.

Літ.: Уизем Дж.Б. Линейные и нелинейные волны: Пер. с англ. М., 1977; Степанов Б.И. Введение в современную оптику: Основные представления оптич. науки на пороге XX в. Мн., 1989.

Б.А.Соцкі, А.Р.Хаткевіч.

ДЫСПЕ́РСНАСЦЬ, характарыстыка памеру часцінак дысперснай фазы ў *дысперсных сістэмах*. Адваротна прапарцыянальная дыяметру часцінкі, характарызуецца велічынёй удзельнай паверхні (усярэднены паказчык Д.) — адносінамі агульнай паверхні дыспергаванага ў дадзеным асяроддзі цела да яго аб'ёму ці масы. Для тонкасітаватых цел аналагічным паняццем з'яўляецца сітаватасць. Д. — важны тэхнал. паказчык у выт-сці пігментаў, напаўняльнікаў пластмас, пестыцыдаў і інш. парашкападобных прадуктаў.

ДЫСПЕ́РСНЫЯ СІСТЭ́МЫ, мікрагетэрагенныя сістэмы з 2 (ці больш) фаз з вельмі развітай паверхняй падзелу паміж імі. Маюць лішак свабоднай энергіі, павышаную хім., часам біял. актыўнасць, і, як правіла, тэрмадынамічна няўстойлівыя. Уласцівасці Д.с. вывучае *калоідная хімія*. Д.с. вельмі пашыраны ў прыродзе (горныя пароды, глебы, грунты, туманы, воблакі, атм. ападкі, раслінныя і жывёльныя тканкі).

У Д.с. адна з фаз утварае неперарыўнае дысперсійнае асяроддзе (ДА), у яго аб'ёме размеркавана дысперсная фаза (ДФ) у выглядзе дробных крышталікаў, кропель ці бурбалачак. Паводле *дысперснасці* (памеру часцінак ДФ) адрозніваюць грубадысперсныя (1 мкм і больш) і тонкадысперсныя ці калоідныя сістэмы (ад 1 нм да 1 мкм); паводле агрэгатнага стану ДА — аэрадысперсныя сістэмы (*аэразолі*), вадкадысперсныя (*золі, суспензіі, пены, эмульсіі*), цвёрдадысперсныя (шклопадобныя ці крышт. целы, напр., рубінавае шкло, мінералы тыпу апалу, пенаматэрыялы). Па інтэнсіўнасці малекулярнага ўзаемадзеяння паміж фазамі адрозніваюць ліяфільныя і ліяфобныя Д.с. (гл. *Ліяфільнасць і ліяфобнасць*). Ліяфільныя Д.с. тэрмадынамічна ўстойлівыя, утвараюцца самаадвольна ў выглядзе высокадысперсных сістэм (калоідных растворaў). Ліяфобныя сістэмы маюць тэндэнцыю да самаадвольнага ўзбуйнення часцінак ДФ (гл. *Каагуляцыя, Каалесцэнцыя*), таму яны існуюць толькі са стабілізатарамі — рэчывамі, якія адсарбіруюцца на паверхні падзелу фаз і ўтвараюць ахоўныя слаі, што перашкаджае збліжэнню часцінак. Д.с. бываюць бесструктурныя і структураваныя (напр., *гелі*). Утвараюцца ў выніку *кандэнсацыі*, калі зародкі, што ўзніклі ў гамагенным асяроддзі (перанасычаны раствор, пара, расплаў), не могуць расці неабмежавана, ці пры *дыспергаванні*.

Літ.: Урьев Н.Б. Высококонцентрированные дисперсные системы. М., 1980; Коагуляционные контакты в дисперсных системах. М., 1982.

У.С.Камароў.

ДЫСПЕ́РСНЫЯ ФАРБАВА́ЛЬНІКІ, нерастваральныя ў вадзе арган. фарбавальнікі, якія выкарыстоўваюць у выглядзе высокадысперсных водных суспензій (памер часцінак 1—2 мкм). Па хім. будове пераважна *азафарбавальнікі* і *антрахінонавыя фарбавальнікі*. Выпускаюць у выглядзе тонкадысперсных парашкоў, гранул ці ў вадкай форме (у т.л. паст). Выкарыстоўваюць для афарбоўкі поліэфірных, поліамідных, ацэтатных валокнаў.

ДЫСПЕТЧАРЫЗА́ЦЫЯ (ад англ. dispatch хутка выконваць), цэнтралізацыя (канцэнтрацыя) апаратыўнага кантролю і кіравання на энергет., прамысл. і інш. прадпрыемствах, заснаваная на выкарыстанні сучасных сродкаў перадачы і апрацоўкі інфармацыі. Забяспечвае ўзгодненую работу асобных звёнаў кіруемага аб'екта з мэтай павышэння тэхніка-эканам. паказчыкаў і рацыянальнага выкарыстання вытв. магутнасцей.

ДЫСПЛЕ́Й (ад англ. display паказваць, узнаўляць), прылада для візуальнага адлюстравання алфавітна-лічбавай і графічнай інфармацыі ў дыялогавым рэжыме работы чалавека з ЭВМ. Адрозніваюць алфавітна-лічбавыя, вектарныя і растравыя Д.; чорна-белага і каляровага адлюстравання; малога, сярэдняга і высокага раздзялення. Д. уваходзіць у склад *персанальнай ЭВМ* або далучаецца да ЭВМ з дапамогай ліній сувязі.

Д. мае экран (электронна-прамянёвыя трубкі, вадкакрышталічны або інш.), генератар сімвалаў і ліній, пульт кіравання з клавіятурай, запамінальнае прыстасаванне і блокі сувязі са знешнімі крыніцамі інфармацыі, таксама можа мець сродкі адваротнай сувязі («мыш», светлавы аловак і інш.) для апаратыўнай карэкцыі інфармацыі на экране. Алфавітна-лічбавы Д. адлюстроўвае інфармацыю з дапамогай зададзенага набору сімвалаў (на экране да 24 радкоў тэксту па 80 сімвалаў у радку). Вектарны Д. — спецыялізаваны Д. для адлюстравання графічнай інфармацыі ў выглядзе адрэзкаў ліній (вектараў). Найб. дасканалы растравы Д., адлюстроўвае інфармацыю ў выглядзе мазаікі святлівых пунктаў (элементаў відарысу), інфармацыя пра кожны элемент захоўваецца ў апорнай памяці Д., ад аб'ёму якой залежыць яго раздзяляльная здольнасць. Выкарыстоўваецца як выхадная прылада (тэрмінал) выліч. сістэм і сетак, а таксама ў аўтаматызаваных сістэмах праектавання, кіравання, інфармацыйна-пошукавых сістэмах, сістэмах перадачы даных і інш.

М.П.Савік.

ДЫСПНО́Э (ад *дыс...* + грэч. pnoē дыханне), расстройства вонкавага дыхання. Выяўляецца рознай ступенню парушэння частаты, амплітуды і рытму дыхальных рухаў ад лёгкіх (на мяжы фізіял. варыянту) да цяжкіх (задышка, дыханне перыядычнае, апноэ і інш.). Першаснае Д. ўзнікае як праяўленне дэфектаў у сістэме рэгуляцыі дыхання або выканаўчых органаў дыхання; другаснае — як ускладненне інфекц., абменных або траўматычных пашкоджанняў дыхальнага цэнтра, нерв. шляхоў, бронхалёгачнага апарату, грудной клеткі, дыяфрагмы.

ДЫСПРАПО́РЦЫІ ў эканоміцы, незбалансаванасць у развіцці асобных галін, узаемазвязаных фаз выт-сці, якая спараджае парушэнне норм ходу працэсу ўзнаўлення. Адрозніваюць асобныя Д., якія маюць лакальны і кароткатэрміновы характар, і агульныя Д., звязаныя з узрушэннем усёй эканомікі. Вял. значэнне для ўзнікнення і развіцця дыспрапарцыянальнасці мае стан спажывання ў дадзеным грамадстве, яго ўзгодненне з выт-сцю і плацежаздольным попытам, што абумоўлена адносінамі ўласнасці. Д. паяўляюцца як парушэнне аб'ектыўна неабходнай сувязі паміж выт-сцю і спажываннем.

ДЫСПРАПО́РЦЫЯ (ад *дыс...* + *прапорцыя*), адсутнасць прапарцыянальнасці, суразмернасці; неадпаведнасць паміж часткамі цэлага, з'явамі, працэсамі, падзеямі.

ДЫСПРО́ЗІЙ (лац. Dysprosium), Dy, хімічны элемент III групы перыяд. сістэмы, ат. н. 66, ат. м. 162,50, адносіцца да *лантаноідаў*. У прыродзе 7 стабільных ізатопаў з масавымі лікамі 156, 158, 160—164. У зямной кары $5—10^{-4}$% па масе. Адкрыў франц. хімік П.Э.Лекок дэ Буабадран у 1886.

Мяккі серабрыста-белы метал, ніжэй за 1384 °С устойлівы α-Dy (шчыльн. 8559 кг/м^3), вышэй пераходзіць у β-Dy (шчыльн. 8660 кг/м^3), $t_{пл}$ 1409 °С. У паветры акісляецца (захоўваюць у вакууме ці інертным асяроддзі). Узаемадзейнічае з вадой, з мінер. кіслотамі (акрамя плавікавай) утварае солі Dy (III), пры награванні — з вадародам, азотам, галагенамі, вугляродам, фосфарам. Выкарыстоўваюць як кампанент спец. магнітных сплаваў.

Літ.: Популярная библиотека химических элементов. 3 изд. М., 1983. Кн. 2. С. 66.

ДЫСПУТ (ад лац. disputo разважаю, спрачаюся), публічная спрэчка на навук., літ. і інш. тэмы. Гл. таксама *Дыскусія*.

ДЫСТАНЦЫ́ЙНАЕ ВЫМЯРЭ́ННЕ, вымярэнне фіз. велічынь (параметраў) на адлегласці. Велічыні, што вымяраюцца, з дапамогай *вымяральных пераўтваральнікаў* (датчыкаў) пераўтвараюцца ў кадзіраваныя сігналы, якія перадаюцца па правадных, радыё-, радыёрэлейных, аптычных (у т.л. лазерных), акустычных і інш. *лініях сувязі*, на прыёмным канцы рэгіструюцца, расшыфроўваюцца (рознымі *дэшыфратарамі*) і запісваюцца ў прыдатнай для далейшага выкарыстання форме. Д.в. прымяняюцца ў выпадках, калі цяжка або немагчыма рабіць вымярэнні з дапамогай прылад, устаноўленых непасрэдна на месцы замеру. Гл. таксама *Тэлевымярэнне*.

ДЫСТАНЦЫ́ЙНАЕ КІРАВА́ННЕ, кіраванне на адлегласці апаратамі, машынамі, тэхн. сістэмамі (напр., рухавікамі, тармазамі, выключальнікамі і інш.).

Бывае мех., пнеўматычнае, эл., радыётэхн. і інш.; мае схемы кіравання, блакіроўкі (забяспечваюць паслядоўнасць аперацый кіравання) і сігналізацыі (паказваюць становішча асобных элементаў абсталявання і кантралююць пашкоджанні ў ланцугах), каналы сувязі і тэхн. прылады (маніпулятары, робаты, радыёэлектронныя, эл.-магн. і інш. прыстасаванні). Выкарыстоўваецца пры цэнтралізацыі кіравання вытв. працэсамі ў хім. прам-сці, нафтавых і газавых промыслах, электраэнергетыцы, на транспарце (у т.л. чыг. і трубаправодным) і інш., для кіравання палётамі ракет і касм. апаратаў, у ваен. справе, а таксама ва ўмовах, небяспечных для чалавека (напр., з-за высокай т-ры, забруджанага асяроддзя, небяспечных выпрамяненняў і інш.). Гл. таксама *Тэлемеханіка*, *Тэлекіраванне*. *М.П.Савік.*

ДЫСТА́НЦЫЯ (ад лац. distantia аддаленасць), 1) аддаленасць, прамежак паміж чым-небудзь («захоўваць Д.», «бег на кароткія Д.»). 2) У ваеннай справе — адлегласць па глыбіні паміж вайскоўцамі, гарматамі, машынамі, падраздзяленнямі, караблямі ў страі, баявым парадку. 3) На чыгунцы —адм.-тэхн. адзінка розных галін чыг. гаспадаркі. Адрозніваюць Д.: пуці, сігналізацыі і сувязі, грамадзянскіх збудаванняў і інш. Д. ажыццяўляюць нагляд за станам тэхн. сродкаў і праводзяць адпаведныя іх прызначэнню работы (рамонт чыг. пуцей, пагрузка грузаў і інш.).

ДЫСТО́РСІЯ (ад лац. distorsio скрыўленне), скажэнні відарысу ў аптычных сістэмах з-за рознага лінейнага павелічэння розных яго частак; адна з *аберацый аптычных сістэм*. У выніку Д. відарыс прамавугольнага прадмета набывае падушка- ці бочкападобную форму. У асобных выпадках (напр., сіметрычныя аб'ектывы або падзорныя трубы) Д. можна ліквідаваць.



а *б* *в*

Дысторсія: *а* — арыгінал; *б*, *в* — падушкападобная і бочкападобная дысторсіі адпаведна.

ДЫСТРАФІ́Я (ад *дыс...* + грэч. trophē харчаванне), якасныя змены хім. саставу, фіз.-хім. якасцей, структуры і функцыі тканак, звязаныя з парушэннем абмену рэчываў; працэс, у выніку якога развіваюцца многія захворванні. Бывае ад непаўнацэннага ці незбалансаванага харчавання, уздзеяння мех. і фіз. фактараў, інфекцыі, інвазіі, інтаксікацыі, парушэння крова- і лімфазвароту, пашкоджання залоз унутр. сакрэцыі і нерв. сістэмы, генет. паталогіі і інш.

Паводле механізма развіцця Д. вылучаюць дэкампазіцыю (хім. перабудова цытаплазмы), інфільтрацыю (празмернае намнажэнне ў тканках розных рэчываў), трансфармацыю (ператварэнне рэчываў, напр. бялкоў у вугляводы, тлушчы і інш.) і скажоны сінтэз. Выяўляецца зменамі колеру, велічыні, формы, кансістэнцыі і малюнка органаў. Адрозніваюць Д. бялковыя, тлушчавыя, вугляводныя і мінеральныя. Д. — працэс абарачальны, але можа прывесці да некрозу.

ДЫСТРАФІ́Я АЛІМЕНТА́РНАЯ, хвароба галодная, хвароба, што развіваецца пры адсутнасці ці недастатковым паступленні харч. рэчываў у арганізм. Адрозніваюць 3 стадыі Д.а. На 1-й стадыі хваробы зніжаецца маса, павышаюцца апетыт, смага, лёгкі ацёк, на 2-й — значныя пахудзенне і ацёкі, мускульная слабасць, цяжкія запоры, паніжэнне т-ры цела, на 3-й стадыі знікае тлушчавая клятчатка, атрафіруюцца мускулы, слабасць, ацёкі ўсяго цела, парушэнне псіхікі. Ускладненні: падае артэрыяльны ціск, анемія, лейкацытапенія, дыспепсія, полінеўрыты, паркінсанізм, зніжэнне памяці, інтэлекту і інш. Лячэнне: паўнацэннае (у невял. дозах) і частае харчаванне, глюкоза, бялковыя прэпараты, пераліванне крыві, сагравanne.

ДЫСТРАФІ́Я ДЗІЦЯ́ЧАЯ, хранічнае расстройства харчавання з парушэннем абмену рэчываў. Найчасцей развіваецца ў дзяцей з пахудзеннем на 10—20% пры 1-й ступені (лёгкая Д.), на 20—30% пры 2-й (сярэдняцяжкая Д.) і больш як на 30% пры 3-й (цяжкай Д.), што парушае гарманічнае развіццё. Бывае з памяншэннем масы цела ў адносінах да яго даўжыні (гіпатрафія), з нармальнай ці лішняй масай цела (паратрафія), з прапарцыянальным зніжэннем масы і даўжыні цела (гіпастатура). Узнікае ва ўлонні маці ці ў першыя тыдні жыцця дзіцяці (нястача ежы і хваробы маці пры цяжарнасці, узрост, прафес. шкоднасці, алкагалізм і інш.) і постнатальна (пасля нараджэння) пад уздзеяннем эндагенных (імунадэфіцытны стан, заганы развіцця ўнутр. органаў, асаблівa страўнікава-кішачнага тракту і інш.) і экзагенных (аліментарныя, інфекц. ўздзеянні, няправільны догляд) фактараў. Д. выклікае парушэнне дзейнасці ферментаў стрававальна-кішачнага тракту, працэсаў расшчаплення і ўсмоктвання харч. рэчываў, абмену буд. і энергет. працэсаў, дзейнасці нерв. сістэмы, кровазвароту. Арганізм знясільваецца, супраціўленне яго зніжаецца, можа развіцца таксіка-септычны стан, што прыводзіць да смерці.

ДЫСТРЫБУТЫ́ЎНАСЦЬ (ад лац. distributivus размеркавальны), уласцівасць, якая звязвае складанне і множанне лікаў і выражаецца формулай $(a+b+...+c)m = am+bm+...+cm$. У агульным выпадку Д. аператара T адносна некаторага дзеяння $x \otimes y$ выражаецца формулай $T(x \otimes y)=T(x) \otimes T(y)$. Напр., падвышэнне да ступені дыстрыбутыўна адносна множання $[(ab)^n = a^n b^n]$.

ДЫСТРЫБУ́ЦЫЯ (ад лац. distributio размеркаванне), сукупнасць моўных адзінак (фанем, марфем, лексем), якія ствараюць кантэкст, або акружэнне той аднародной ім адзінкі, што падлягае даследаванню. У пісьмовым тэксце адрозніваюць Д., складзеную лінейным (прасторавым) акружэннем адзінак, і Д., выведзеную з іх спалучальнасці. Пры першым падыходзе ў залежнасці ад мэты і характару даследавання ўлічваецца акружэнне на глыбіню аднаго кампанента (г.зн. разглядаюцца толькі тыя адзінкі, што непасрэдна размешчаны справа і злева ад зададзенай), ці, адпаведна, двух, трох і г.д. кампанентаў. Пры другім падыходзе Д. ствараюць адзінкі, якія граматычна спалучаюцца з зададзенай. Наяўнасць у моўных кампанентаў тоеснай, падобнай або рознай Д. дае падставы для вылучэння ў тэксце аднародных адзінак і іх класаў, а таксама для разнастайнай характарыстыкі як знешніх (фармальных) рыс, так і ўнутраных, якасных уласцівасцей гэтых адзінак. Панятце Д. пакладзена ў аснову дыстрыбутыўнага метаду (гл. ў арт. *Дэскрыптыўная лінгвістыка*). На аснове розных відаў Д. ў сучаснай лінгвістыцы распрацаваны дасканалыя метады даследавання лексічных значэнняў: дыстрыбутыўна-трансфармацыйны, дыстрыбутыўна-статыстычны і інш.

Літ.: Плотников Б.А. Дистрибутивно-статистический анализ лексических значений. Мн., 1979. *Б.А.Плотнікаў.*

ДЫ́СТРЫКТ (англ. district ад позналац. districtus), 1) адм.-тэр. адзінка ў складзе дэпартамента, створаная на тэр. былых паветаў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губ. і Беластоцкай вобл. ў час заняцця іх франц. войскамі ў вайну 1812. Тэрытарыяльна Д. супадаў з паветам. У Віленскім дэпартаменце было 11 Д., у Гродзенскім — 8, у Мінскім — 10, у Беластоцкім — 3. 2) У шэрагу краін (напр., у ЗША, Вялікабрытаніі) назва ніжэйшай адм. адзінкі суд. або выбарчай акругі.

ДЫСТРЭ́С-СІНДРО́М, хвароба нованароджаных у першыя гадзіны жыцця, якая праяўляецца цяжкімі дыхальнымі расстройствамі. Прычыны Д.-с. — заганы развіцця лёгкіх, сэрца, родавая траўма, унутрывантробныя інфекцыі, заў-

часныя роды, хваробы цяжарных (вірусная інфекцыя, цукровы дыябет, анемія і інш.). Прыкметы: частае дыханне, цыяноз, вяласць, санлівасць, прыгнечанасць рэфлексаў, страта прытомнасці, сардэчная недастатковасць, ацёкі, панжэнне т-ры цела і інш.

ДЫСТЫЛЯВА́НАЯ ВАДА́, вада, ачышчаная ад растворaных у ёй мінер. солей, арган. рэчываў і інш. прымесей шляхам *дыстыляцыі*. Мае pH 5,4—6,6, удзельнае эл. супраціўленне $2 \cdot 10^5$ Ом·м (не менш) пры 20 °С; сухі астатак пасля выпарэння 1 л Д.в. 5±0,0002 мг (не больш). Іонаабменным метадам атрымліваюць дэмінералізаваную ваду, якая адпавядае патрабаванням да Д.в., але мае больш арган. рэчываў, што акісляюцца перманганатам калію. Выкарыстоўваюць у вытв-сці лек. сродкаў, прадуктаў харчавання, у прам-сці для атрымання чыстых рэчываў, электралітаў, у хім. лабараторыях. Гл. таксама *Бідыстылят*.

ДЫСТЫЛЯ́ЦЫЯ (ад лац. distillatio сцяканне кроплямі), перагонка, раздзяленне вадкіх сумесей на фракцыі рознага саставу. Засн. на адрозненні саставу вадкасці і пары, што ўтвараецца з яе. Ажыццяўляюць частковым *выпарэннем* вадкасці з наступнай *кандэнсацыяй* пары.

Пры Д. атрымліваюць кандэнсат (дыстылят) — вадкасць, якая мае большую колькасць, адносна зыходнай сумесі, нізкакіпячых (больш лятучых) кампанентаў, і неадгнаную вадкасць (кубавая астача), у якой больш высокакіпячых рэчываў. Д. наз. фракцыйнай (дробнай), калі з зыходнай сумесі адганяюць некалькі фракцый. У залежнасці ад умоў працэсу (ціск, т-ра) адрозніваюць Д. простую і малекулярную, якую ажыццяўляюць пры т-рах, ніжэйшых за т-ры кіпення вадкасці, і нізкім ціску (менш за 0,13 Па). Простую Д. робяць пры паступовым ці аднаразовым выпарэнні. Пры паступовым выпарэнні пара, што ўтвараецца над вадкасцю, бесперапынна адводзіцца з апарата, пры аднаразовым — увесь час награвання да вызначанай т-ры застаецца ў сістэме ў кантакце з вадкасцю (пара-вадкасную сумесь раздзяляюць у сепаратары). Прысутнасць пары зніжае парцыяльны ціск высокакіпячых фракцый у сістэме і дазваляе весці перагонку пры больш нізкай т-ры (параўнальна з т-рай Д. пры паступовым выпарэнні). Пры неабходнасці зніжэння т-ры працэсу робяць Д. з вадзяной парай ці інертным газам. Выкарыстоўваюць у хім., нафтаперапрацоўчай, фармацэўтычнай прам-сці, у лабараторнай практыцы. Гл. таксама *Рэктыфікацыя, Перагонка нафты*.

Я.І.Шчарбіна.

ДЫСТЭ́Н, мінерал, гл. *Кіяніт*.

ДЫ́СТЭРВЕГ (Diesterweg) Фрыдрых Адольф Вільгельм (29.10.1790, г. Зіген, Германія — 7.7.1866), ням. педагог-практык. Паслядоўнік І.Г.*Песталоці*. Вучыўся ва ун-тах у Гайдэльбергу, Гербарне, Цюбінгене ў 1811—20. Выкладаў у гімназіях, узорных школах, наст. семінарыях. У 1827—66 выдаваў пед. час. «Рэйнскія лісткі...». Быў супраць саслоўных і нац. абмежаванняў у галіне адукацыі, канфесійнага навучання і апекі школы царквой. Імкнуўся да аб'яднання ням. настаўніцтва, выступаў за мірнае пераўтварэнне грамадскіх адносін, у якім асн. ролю адводзіў асвеце, падзяляў ідэі агульначалавечага выхавання. Асн. прынцыпамі выхавання лічыў прыродаадпаведнасць, культураадпаведнасць, саманадзейнасць. Распрацаваў дыдактыку развіваючага навучання. Аўтар больш як 20 падручнікаў і дапаможнікаў па матэматыцы, ням. мове, прыродазнаўстве, геаграфіі, астраноміі, у т.л. вядомай працы «Дапаможнік да адукацыі нямецкіх настаўнікаў» (т. 1—2, 1835). Пед. ідэі Д. зрабілі ўплыў на развіццё адукацыі ў Германіі і пашырыліся за яе межамі.

ДЫСФУ́НКЦЫЯ (ад *дыс...* + *функцыя*), парушэнне функцыі сістэмы, органа або тканкі арганізма, якое выражаецца неадэкватнасцю рэакцыі на ўздзеянне раздражняльнікаў. Аснова Д. — парушэнні абмену рэчываў і энергіі, якія выяўляюцца на ўзроўні клеткі, тканкі, органа, сістэмы або цэласнага арганізма і выражаюцца ў зменах росту, размнажэння, развіцця, харчавання, дыхання, руху. Праяўляецца ў форме дыстрафій, звязаных з назапашваннем у клетках і тканках зменены прадуктаў абмену, дысплазій і дыстапій — змен развіцця або стану органаў у выніку дысэмбрыягенезу, дыскінезій — расстройстваў кардынаваных рухальных актаў, *дыспепсій* — расстройстваў стрававання. Прыклады асобных форм Д.: дысгенезія ганад, дысбазія (расстройства хады), дысгідроз (расстройства потавыдзялення), дыскальцынацыя эмалі, дыскапатыі (пашкоджанне міжпазваночных дыскаў), дысфагія (расстройства глытання), дысфазія (парушэнне мовы), дысфанія (расстройства голасаўтварэння), *дысменарэя* (расстройства менструальнага цыкла), дысфарыя (расстройства настрою), дыссалюцыі (расстройства псіхічнай дзейнасці) і інш.

А.С.Леанцюк.

ДЫСЦЫПЛІ́НА (ад лац. disciplina навучанне, выхаванне), 1) абавязковы парадак паводзін грамадзян, членаў пэўнага калектыву, дзейнасці арг-цый, які адпавядае нормам права і маралі або патрабаванням той ці інш. арг-цыі. У грамадстве існуюць агульнаабавязковыя Д. (дзяржаўная) і спец. Д. (ваен., дагаворная, фін., *працоўная дысцыпліна* і інш.). Д. канкрэтызуецца адпаведнымі дзярж. актамі, статутамі, правіламі. 2) Галіна навук. ведаў, вучэбны прадмет.

ДЫСЦЫПЛІНА́РНАЯ АДКА́ЗНАСЦЬ, гл. ў арт. *Адказнасць*.

ДЫСЦЫПЛІНА́РНЫ А́РЫШТ, гл. ў арт. *Арышт*.

ДЫСЦЫПЛІНА́РНЫ БАТАЛЬЁН, спецыяльная вайсковая часць, у якой асуджаны ваеннаслужачы адбывае пакаранне. Паводле крымін. заканадаўства Рэспублікі Беларусь да ваеннаслужачых тэрміновай службы, якія ўчынілі злачынства, можа прымяняцца накіраванне ў Д.б. у выпадках, прадугледжаных законам, на тэрмін ад 3 месяцаў да 2 гадоў, а таксама ў выпадках, калі суд, прымаючы пад увагу абставіны справы і асобу асуджанага, палічыць мэтазгодным замест пазбаўлення волі на тэрмін да 3 гадоў прымяніць накіраванне ў Д.б. на той жа тэрмін.

ДЫТЦ (Ditz) Ян Фрэдэрык, мастак 18 ст. Паходзіў з Саксоніі. Працаваў размалёўшчыкам і злотнікам шкла, фаянсу, маёлікі ў жывапісных майстэрнях Навасвержанскай фаянсавай мануфактуры і на Урэцкай шклагуце (1739—43). Размалёўваў золатам і рубінавыя, бясколерныя медальёны, адлітыя ў формах. Ведаў састаў добрага шкла. З 1756 працаваў у Слуцкім тэатры Радзівіла, з 1759 пры дварах кн. Радзівілаў у Польшчы і Нясвіжы.

Літ.: Яніцкая М.М. Беларускае мастацкае шкло (XVI—XVIII стст.). Мн., 1977; Kamieńska Z. Manufaktura szklana w Urzeczu, 1737—1846. Warszawa, 1964.

І.М.Каранеўская.

ДЫУРЭ́З (ад *ды...* + грэч. urēsis мочаспусканне), гл. *Мочавыдзяленне*.

ДЫФАЗІ́ЯСТР (Diphasiastrum), род споравых раслін сям. дзеразовых. 25 відаў. Пашыраны амаль па ўсім зямным шары. На Беларусі трапляюцца Д. сплюшчаны (D. complanatum) і Д. трохкаласковы (D. tristachyum), якія зрэдку скрыжоўваюць з утварэннем шэрагу прамежкавых форм, напр., Д. Зейлера (D. × zeileri). Растуць у імшыстых хваёвых лясах.

Шматгадовазялёныя дзярэзападобныя расліны з доўгімі паўзучымі падземнымі парасткамі. Сцёблы да 1 м даўж., сплюшчаныя, дыхатамічныя, укрытыя дробным лускападобным супраціўным лісцем. *Стробілы* тупыя, размешчаны па 1—6 (да 12) на доўгіх дыхатамічна разгалінаваных ножках. *Спарафілы* акругла-яйцападобныя, з 1 *спарангіем*. Гаметафіт (зарастак) падземны, клубнепадобны, з мікарызай. Лек., фарбавальныя і дэкар. расліны.

Г.У.Вынаеў.

Дыфазіястр сплюшчаны.

ДЫФАМА́ЦЫЯ (ад лац. diffamatio ганьбаванне), выказванне ў сродках масавай інфармацыі сапраўдных або ілжывых звестак, якія ганьбяць гонар і годнасць грамадзяніна або арганізацыі, установы. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадугледжвае судовую абарону гонару і годнасці права зняважаных на матэрыяльнае кампенсаванне маральнай шкоды.

ДЫФАСГЕ́Н, трыхлорметылхлоркарбанат, эфір хлорвугальнай к-ты, $CCl_3OC(O)Cl$. Бясколерная вадкасць, дыміць у паветры, мае пах прэлага сена, $t_{кіп}$ 128 °С, шчыльн. 1664 кг/м³ (20 °С). Узаемадзейнічае з водным растворамі шчолачаў, аміяку, амінаў (гэтыя рэакцыі выкарыстоўваюць для дэгазацыі Д.). Аказвае раздражняльнае і моцнае ўдушлівае дзеянне: смяротная канцэнтрацыя 1 мг/л пры экспазіцыі 5 мін, скрыты перыяд дзеяння 6—8 гадз. У 1-ю сусв. вайну выкарыстоўваўся як атрутнае рэчыва.

ДЫФЕНІ́Л, фенілбензол, араматычны вуглевадарод, $C_6H_5—C_6H_5$. Бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 70,5 °С, шчыльн. 1180 кг/м³ (0 °С). Не растваральніках. Уваходзіць у склад антрацэнавай фракцыі *каменнавугальнай смалы*. У прам-сці атрымліваюць дэгідрыраваннем бензолу пры 700—800 °С. Выкарыстоўваюць як высокатэмпературны цепланосьбіт (даўтэрм-10 — сумесь Д. з дыфенілаксідам), фунгіцыд (напр., для прамочвання паперы для ўпакоўкі фруктаў). Пыл Д. раздражняе слізістыя абалонкі вачэй і дыхальных шляхоў, ГДК 1 мг/м³.

ДЫФЕНІЛАМІ́Н, араматычны другасны амін, $NH(C_6H_5)_2$. Бясколерныя крышталі, цямнеюць на святле, $t_{пл}$ 54—55 °С, $t_{кіп}$ 302 °С, шчыльн. 1159 кг/м³ (25 °С). Не растваральніках. У прам-сці атрымліваюць узаемадзеяннем аніліну з яго гідрахларыдам пры 300 °С у прысутнасці каталізатара. Выкарыстоўваюць у вытв-сці азафарбавальнікаў, інсектыцыдаў, як стабілізатар пораху і пластмас, інгібітар карозіі мяккіх сталей, індыкатар у аналіт. хіміі. Таксічны, ГДК 10 мг/м³.

ДЫФЕНІЛОЛПРАПА́Н, бісфенол А, 2,2-дыдыфенілпрапан, араматычнае арган. злучэнне. Бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 157 °С. Растваральніках. Атрымліваюць кандэнсацыяй фенолу з ацэтонам. Выкарыстоўваюць у вытв-сці эпаксідных смол, полікарбанатаў і інш. палімераў. Раздражняе скуру і слізістыя абалонкі дыхальных шляхоў і вачэй, ГДК 5 мг/м³.



ДЫФЕРЭНЦАВА́ЛЬНАЕ ПРЫСТАСАВА́ННЕ, дыферэнцыятар, прыстасаванне для пераўтварэння ўваходнага ўздзеяння ў сігнал, які характарызуе скорасць змянення ўваходнай велічыні (з'яўляецца яе вытворнай). Напр., калі ўваходная велічыня — вугал павароту вала, то выхадная — частата яго вярчэння. У аналагавых выліч. машынах і прыладах кіравання выкарыстоўваюць схемы, з дапамогай якіх аперацыя дыферэнцавання выконваецца набліжана. Бываюць мех. (фрыкцыйныя, цэнтрабежныя і інш.), эл. (дыферэнцавальныя ланцугі, трансфарматары, актыўныя электронныя дыферэнцавальныя элементы), эл.-мех. (тахагенератары пастаяннага і пераменнага току і інш.). Выкарыстоўваюцца ў выліч. прыстасаваннях, сістэмах аўтам. рэгулявання і інш.

М.П.Савік.

ДЫФЕРЭНЦАВА́ННЕ ў матэматыцы, аперацыя адшукання *вытворнай* (або *дыферэнцыяла*) па пэўных правілах (гл. табл.) Бывае аналітычнае (гл. *Дыферэнцыяльнае злічэнне*), графічнае (гл. *Графічныя вылічэнні*) і лікавае (гл. *Лікавыя метады*). Фіз. сэнс Д. — знаходжанне скорасці змянення пераменнай велічыні (функцыі).

Літ.: Гусак А.А. Высшая математика. Т. 1. 2 изд. Мн., 1983; Курс вышэйшай матэматыкі. Мн., 1994.

А.А.Гусак.

Асноўныя правілы дыферэнцавання і вытворныя некаторых элементарных функцый

Функцыя $f(x)$	Вытворная $f'(x)$
$C = \text{const}$	0
$Cu(x)$	$Cu'(x)$
$u(Cx)$	$Cu'(Cx)$
$u(x) \pm v(x)$	$u'(x) \pm v'(x)$
$u(x) \cdot v(x)$	$u'(x) \cdot v(x) + u(x) \cdot v'(x)$
$u(x) / v(x)$	$[u'(x)v(x) - u(x)v'(x)]/v^2(x)$
$u(g(x))$	$\frac{du}{dg} \cdot \frac{dg}{dx} = u'(g) \quad g'(x)$
x^a	ax^{a-1} (a=const; $x \neq 0$ пры $a \leq 1$)
a^x	$a^x \ln a$ ($a>0$; $a=1$)
e^x	e^x
$\ln x$	$1/x$
$\sin x$	$\cos x$
$\cos x$	$-\sin x$
$\operatorname{tg} x$	$1/(\cos^2 x)$
$\operatorname{ctg} x$	$-1/(\sin^2 x)$
$\arcsin x$	$1/\sqrt{1-x^2}$
$\arccos x$	$-1/\sqrt{1-x^2}$
$\operatorname{arctg} x$	$1/(1+x^2)$
$\operatorname{arcctg} x$	$-1/(1+x^2)$

ДЫФЕРЭНЦЫ́РАВАННЕ ЦЭН, устанаўленне розных аптовых, закупачных і рыначных цэн на аднолькавую прадукцыю па незалежных ад прадпрыемства адрозненнях у выдатках на яе вытв-сць і рэалізацыю. Д.ц. можа быць: сезоннае (цэны ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад пары года, сезона); тэрытарыяльнае (устанаўленне цэн залежыць ад тэрыторыі, дзе прадукцыя выкарыстоўваецца з улікам пэўных фактараў, што ўплываюць на іх). Д.ц. адбываецца таксама ў залежнасці ад якасных адрозненняў прадукцыі (гатунку, класа, навізны і інш. прыкмет).

ДЫФЕРЭНЦЫ́РАВАНЫ ТАРЫ́Ф, мытны тарыф, які дазваляе аддаваць перавагу пэўным таварам і ствараць ім ільготныя мытныя ўмовы або не прапускаць іх у залежнасці ад таго, у якой краіне яны выраблены.

ДЫФЕРЭНЦЫРО́ЎКА, працэс узнікнення адрозненняў паміж часткамі арганізма і іх спецыялізацыі ў час развіцця; адно з асн. паняццяў тэорыі антагенезу. Праяўляецца ў марфал., фізіял. і біяхім. змяненнях клетак (цыталагічная Д.), тканак (гісталагічная Д.) або асобных органаў і арганізма ў цэлым. Адбываецца пераважна ў перыяд зародкавага развіцця (атыпічная, бластамерная, зачаткавая і тканкавая стадыі). Ажыццяўляецца на аснове рэалізацыі выбіральнай актыўнасці спецыфічных для кожнай тканкі генаў, што прыводзіць да сінтэзу спецыфічных РНК, бялкоў, гліказапратэідаў, якія вызначаюць узаемадзеянні клетак. Пасля нараджэння арганізма назіраецца Д. ў эпітэліяльных тканках, крыві, гладкіх мышцах і інш. З Д. звязана пераважна ўзнікненне новых органаў або іх уласцівасцей у час *метамарфозу*. Ва ўмовах шкодных фактараў уздзеяння або пры злаякасным перараджэнні клетак магчыма частковая дэдыферэнцыроўка і набыццё здольнасці да Д. ў іншым кірунку (*метаплазія*).

А.С.Леанцюк.

ДЫФЕРЭНЦЫ́ЯЛ у матэматыцы, галоўная лінейная частка поўнага прырашчэння функцыі. Формулы і правілы знаходжання Д. вынікаюць з формул і правіл *дыферэнцавання* функцый. Паняцце Д. адлюстроўвае блізкасць дадзенай функцыі да лінейнай у малым наваколлі разгляданага пункта, абагульняецца на адлюстраванне адной эўклідавай прасторы на другую, на камплексныя і вектар-функцыі і з'яўляецца адным з асн. паняццяў сучаснага нелінейнага функцыянальнага аналізу.

Калі поўнае прырашчэнне $\Delta y = f(x_0+\Delta x) - f(x_0)$ функцыі $y = f(x)$ у пункце $x=x_0$ можна запісаць у выглядзе $\Delta y = A(x_0)\Delta x + a\Delta x$, дзе $a \to 0$ пры $\Delta x \to 0$, то комплекс $A(x_0)\,\Delta x$ наз. дыферэнцыялам функцыі ў пункце x_0 [абазначаецца dy або $df(x_0)$], а саму функцыю — дыферэнцавальнай і яе вытворная $f'(x_0) = A(x_0)$. Д. незалежнай пераменнай супадае з яе прырашчэннем і таму $dy = A(x_0)dx$ і вытворную $f'(x_0) = \frac{dy}{dx}$ можна трактаваць як дзель двух Д. Для складанай функцыі $y = f(g(x))$ Д. у пункце $x = x_0$ можна запісаць у выглядзе $dy =$

$=y'_g g'dx = y'_x dx$. Для функцый некалькіх пераменных разглядаюць частковыя і поўныя Д.: частковы Д. роўны здабытку *частковай вытворнай* на адпаведны Д. пераменнай, поўны Д. роўны суме частковых Д.

Літ.: Гусак А.А., Гусак Г.М. Справочник по высшей математике. Мн., 1991; Курс вышэйшай матэматыкі. Мн., 1994.

А.А.Гусак.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́Л у тэхніцы, зубчасты механізм, які перадае рух ад аднаго вала двум іншым, што круцяцца з рознымі адноснымі скарасцямі, або ад двух валоў аднаму. Д. у трансмісіі аўтамабіля або колавага трактара дае магчымасць вядучым колам круціцца з рознымі скарасцямі, што неабходна на паваротах. Выкарыстоўваецца таксама ў механізмах прыводу вінтоў турбавінтавых самалётаў, на гусенічных машынах (падвойныя або складаныя Д., якімі карыстаюцца як механізмамі павароту).



Дыферэнцыял аўтамабіля: 1 — сатэліт; 2 — вадзіла; 3 — вал рухавіка; 4 — цэнтральнае кола.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНАЕ ЗЛІЧЭ́ННЕ, раздзел матэматыкі, які вывучае *вытворныя* і *дыферэнцыялы* функцый, а таксама іх дастасаванні. Разам з *інтэгральным злічэннем* складае курс матэматычнага аналізу (ці аналізу бясконца малых).

Аформілася ў самастойную матэм. дысцыпліну пасля прац І.*Ньютана* і Г.*Лейбніца*, якія сфармулявалі асн. палажэнні Д.з. і паказалі ўзаемна адваротны характар аперацый *дыферэнцавання* і *інтэгравання*. Выклікала з'яўленне новых галін матэматыкі: тэорыі шэрагаў, дыферэнцыяльнай геаметрыі, дыферэнцыяльных ураўненняў, варыяцыйнага злічэння. Грунтуецца на паняццях: рэчаісны лік, функцыя, ліміт, бясконца малая, неперарыўнасць і інш., якія атрымалі сучасны змест у ходзе развіцця і абгрунтавання аналізу бясконца малых; цэнтральныя паняцці Д.з. — вытворная і дыферэнцыял — і распрацаваны ў Д.з. апарат, які звязаны з імі, даюць сродкі даследавання функцый (у т.л. некалькіх пераменных), лакальна падобных на лінейныя функцыі або паліномы. Асн. дастасаванні Д.з. звязаны з даследаваннем функцый з дапамогай вытворных: знаходзіць *выпукласць і ўвагнутасць* графіка функцыі, прамежкі *нарастання і спадання функцый*, іх найбольшае і найменшае значэнне (гл. *Экстрэмум*), пункты перагіну і *асімптоты*, а таксама розныя ліміты функцый (напр., віду 0/0, ∞/∞ ; гл. *Нявызначаны выраз*), якія не паддаюцца вылічэнню інш. метадамі. Метады Д.з. маюць шматлікія дастасаванні ў даследаваннях актуальных праблем матэматыкі, прыродазнаўчых і тэхн. навук.

Літ.: Курс вышэйшай матэматыкі. Мн., 1994; Гусак А.А. Высшая математика. Т. 1—2. 2 изд. Мн., 1983—84.

А.А.Гусак.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНАЯ ГЕАМЕ́ТРЫЯ, раздзел *геаметрыі*, у якім геам. вобразы (крывыя і паверхні) вывучаюцца метадамі матэм. аналізу, у першую чаргу — *дыферэнцыяльнага злічэння*. Аб'екты Д.г. — крывыя і паверхні эўклідавай прасторы, іх сем'і (неперарыўныя сукупнасці крывых і паверхняў). У Д.г. даследуюцца ўласцівасці, характэрныя бясконца малой частцы геам. вобразаў (дыферэнцыяльныя ўласцівасці). У адрозненне ад элементарнай і аналітычнай геаметрыі, якія вывучаюць асобныя крывыя і паверхні ці спец. класы крывых і паверхняў, Д.г. разглядае крывыя і паверхні наогул.

Класічная Д.г. вывучае дыферэнцыяльныя ўласцівасці геам. вобразаў звычайнай трохмернай прасторы, якія не залежаць ад становішча ў прасторы. Асобныя паняцці Д.г. сустракаюцца ў 2-й пал. 17 ст. ў працах англ. вучонага І.Ньютана, ням. матэматыка Г.Лейбніца і інш. Асновы тэорыі паверхняў закладзены ў канцы 18 ст. працамі ням. вучонага Л.Эйлера і франц. вучонага Г.Монжа. Значны ўклад у развіццё Д.г. зрабілі К.Гаўс, рус. матэматыкі К.М.Петэрсон (пабудаваў асновы класічнай тэорыі паверхняў) і М.І.Лабачэўскі, ням. матэматык Б.Рыман. Асн. кірункі сучаснай Д.г.: геаметрыя аднародных прастораў, у якіх дзейнічае некат. сукупнасць (група) пераўтварэнняў (у класічнай Д.г. — група рухаў) і вывучаюцца ўласцівасці геам. вобразаў, што не мяняюцца пры пэўных пераўтварэннях; геаметрыя абагульненых прастораў, якія будуюцца на аснове дыферэнцаванай разнастайнасці, што ўключае як прыватны выпадак паняцці крывой і паверхні класічнай Д.г. Асобнае месца займае «геаметрыя ў цэлым», якая даследуе геам. вобразы, што не могуць быць вырашаны сродкамі дыферэнцыяльнага злічэння.

На Беларусі сістэматычныя даследаванні па сучаснай Д.г. пачалі праводзіцца з канца 1960-х г. Пабудавана глабальная тэорыя нармалізаваных і спалучаных звязнасцей у галоўных расслаеннях, праведзена даследаванне сіметрычных прастораў і шэрагу іх абагульненняў (В.І.*Вядзернікаў*, А.С.*Фядзенка*).

Літ.: Погорелов А.В. Дифференциальная геометрия. 5 изд. М., 1969; Дифференциальная геометрия. Мн., 1982; Феденко А.С. Пространства с симметриями. Мн., 1977; История отечественной математики. Т. 3. Киев, 1968.

В.І.Вядзернікаў, А.А.Гусак.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНАЯ ПСІХАЛО́ГІЯ, галіна псіхалогіі, якая вывучае псіхічныя адрозненні паміж індывідамі і групамі людзей. Даследуе інтэлектуальныя асаблівасці людзей у залежнасці ад узросту, полу, сац., прафес., этн. прыналежнасці, спецыфіку іх інтарэсаў, маральных установак, эмацыянальных рэакцый. Складвалася пад уплывам пед., мед. і інжынернай практыкі, яе ўзнікненню садзейнічала ўвядзенне ў псіхалогію эксперымента, матэм. і генет. метадаў даследавання. Тэрмін увёў ням. псіхолаг В.Штэрн у працы «Аб псіхалогіі індывідуальных адрозненняў» (1900). Заснавальнік Д.п. — англ. псіхолаг Ф.Гальтан, найб. вядомыя прадстаўнікі: А.Бінэ (Францыя), Дж.Кетэл (ЗША), А.Ф.Лазурскі (Расія) і інш. Прыхільнікі Д.п. лічаць, што акрамя ўздзеяння нейрафізіял. і спадчынных фактараў на індывід.-псіхал. адрозненні асобы ўплываюць сац. і культ. ўмовы развіцця індывіда, асаблівасці выхавання, лад жыцця, *ментальнасць* і інш. Даследаванні ў галіне Д.п. садзейнічаюць удасканаленню практыкі навучання і выхавання, прафес. адбору персаналу, дыягностыцы здольнасцей індывіда і інш.

Літ.: Асмолов А.Г. Психология личности. М., 1990; Видинеев Н.В. Природа интеллектуальных способностей человека. М., 1989; Голубева Э.А. Способности и индивидуальность. М., 1993.

Э.С.Дубянецкі.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНАЯ РЭ́НТА, дадатковы прыбытак, які ствараецца ў выніку затрат працы на сярэдніх і лепшых зямельных участках пры павышэнні прадукцыйнасці ці дадатковых укладанняў капіталу і прысвойваецца ўласнікам зямлі; адна з форм *зямельнай рэнты*. Крыніца яе — лішак прыбавачнай вартасці, што ствараецца працай с.-г. наёмных рабочых над сярэднім прыбыткам, і ўзнікае праз больш высокую прадукцыйнасць працы на адносна лепшых зямельных участках (больш урадлівых ці размешчаных бліжэй да месца збыту або ў якія ўкладзены дадатковы капітал).

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНЫ МАНО́МЕТР, дыфманометр, прылада для вымярэння рознасці (перападу) ціску вадкіх і газападобных рэчываў, узроўню вадкасці, а таксама расходу вадкасці, пары, газу па перападзе ціску. Бываюць прамапаказвальныя, самапішучыя і бяскшкальныя (з эл. або пнеўматычнай перадачай паказанняў); паводле прынцыпу дзеяння адрозніваюць вадкасныя (вымераны ціск ураўнаважваецца слупком вадкасці) і мех. (ціск ураўнаважваецца сіламі пругкасці мембраны, спружыны, сільфона). Асн. тэхн. характарыстыкі: перапад ціскаў і найб. статычны ціск, на які разлічана прылада. Гл. таксама *Расхадамер*.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНЫ МЕ́ТАД ВЫМЯРЭ́ННЯЎ, метад *вымярэнняў*, пры якім вызначаюць рознасць паміж велічынёй, што вымяраецца, і вядомай фіз. велічынёй, якая ўзнаўляецца з дапамогай *меры*. Выкарыстоўваецца пры праверцы сродкаў вымярэнняў, выпрабаванні матэрыялаў і вырабаў (параўнанне іх з узорнымі). Д.м.в. ператвараецца ў *нулявы метад вымярэнняў*, калі рознасць паміж велічынёй, што вымяраецца, і вядомай даводзяць да нуля.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНЫ СЛО́ЎНІК, лінгвістычны даведнік, што тлумачыць

або перакладае толькі тую лексіку, якой адрозніваюцца слоўнікавыя склады 2 блізкароднасных моў або слоўнікі адной і той жа мовы. Першыя Д.с. бел. мовы — «Слоўнік беларускай мовы» І.І.Насовіча (1870) і рукапісны «Беларускі слоўнік» С.Мядзведскага (1910), якія перакладалі на рус. мову тыя бел. словы, што лексічна і семантычна адрозніваліся ад адпаведных рус. слоў. Падобны двухмоўны Д.с. — слоўнікавы дадатак «Кароткі дыферэнцыяльны руска-беларускі слоўнік» да практычнага дапаможніка «Беларуская мова для небеларусаў» А.А.Крывіцкага, А.Я.Міхневіча, А.І.Падлужнага (1973).

Існуюць і інш. разнавіднасці Д.с.: дыферэнцыяльна-дыялектныя або абласныя даведнікі (у адрозненне ад поўных *дыялектных слоўнікаў* уключаюць толькі тыя дыялектызмы, якімі дадзеная гаворка або група гаворак адрозніваюцца ад слоўнікавага складу літ. мовы, напр., «Краёвы слоўнік Чэрвеншчыны» М.В.Шатэрніка, 1929, «Слоўнік Гродзенскай вобласці» Т.П.Сцяшковіч, 1983); дыялектныя даведнікі, што ўводзяць у навук. ўжытак упершыню лексікаграфічна зафіксаваныя лексічныя і фразеалагічныя адзінкі, якія адсутнічалі ў папярэдніх рэгіянальных слоўніках (напр., «З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік» І.Я.Лепешава, 1991). Асобныя даследчыкі (Крывіцкі, Г.А.Цыхун) вылучаюць змяшаны (дыферэнцыяльна поўны) тып дыялектнага слоўніка.

Літ: Норман Б.Ю. Гипотеза Сэпира-Уорфа и белорусско-русский дифференциально-семантический словарь // Актуальные проблемы лексикологии. Мн., 1970.

В.К.Шчэрбін.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЛЬНЫЯ ЎРАЎНЭ́ННІ, ураўненні, якія змяшчаюць невядомыя функцыі, іх вытворныя любых парадкаў і незалежныя пераменныя. Уведзены ў матэматыку І.*Ньютанам* і Г.*Лейбніцам*. Іх сістэматычнае вывучэнне пачаў Л.*Эйлер*. У 19 ст. Д.ў. сталі самастойнай матэм. дысцыплінай. Заснавальнікі сучаснай тэорыі Д.у. — А.М.*Ляпуноў*, У.А.*Сцяклоў* і інш.

Змена масы m радыеактыўнага рэчыва з каэфіцыентам распаду k за прамежак часу dt выражаецца Д.у. $dm=kmdt$ (1). Тэмпература $U = U(x, y, z)$, што ўстанавілася ў кожным пункце (x, y, z) цела, на мяжы якога падтрымліваецца зададзены цеплавы рэжым, задавальняе Д.ў. $\frac{\partial^2 U}{\partial x^2} + \frac{\partial^2 U}{\partial y^2} + \frac{\partial^2 U}{\partial z^2} = 0$ (2).

Д.ў. віду (1) — звычайнае Д.ў. (змяшчае функцыю аднаго пераменнага), віду (2) — Д.ў. ў частковых вытворных (змяшчае вытворныя невядомай функцыі па розных пераменных). Парадак Д.ў. вызначаецца вытворнай самага высокага парадку ў гэтым ўраўненні. Кожнае Д.ў. вызначае адразу цэлую сям'ю рашэнняў, залежную ад лікавых ці функцыянальных параметраў; яно выражае некаторы агульны закон, якому падпарадкоўваецца мноства канкрэтных працэсаў. Для вылучэння асобнага працэсу задаюць дадатковыя ўмовы, найчасцей — краявыя (пачатковыя і гранічныя). Для рашэння (1) задаецца пачатковае значэнне — маса $m(0) = m_0$. Рашэнне (2) вызначаецца, напр., гранічнымі значэннямі — размеркаваннем тэмпературы на паверхні цела. Звычайнае лінейнае Д.ў. або сістэму гэтых Д.у. увядзеннем дапаможнай функцыі можна запісаць у выглядзе $x' = P(t)x + \varphi(t)$, дзе P — матрыца каэфіцыентаў, φ — вектар свабодных членаў, $x = x(t)$ — вектар-функцыя. Калі Y — квадратычная матрыца, якая складаецца з незалежных рашэнняў адпаведнай аднароднай сістэмы ($\varphi \equiv 0$), а x^* — адно з рашэнняў прыведзенага Д.ў., тады ўсе яго рашэнні даюць формула $x = x^* + Yc$, дзе c — адвольны пастаянны вектар. У шэрагу выпадкаў, напр. пры пастаяннай P, пабудова x^* і Y зводзіцца да алгебраічных аперацый і інтэгравання. Існуюць і нелінейныя Д.ў., якія рашаюцца з дапамогай канечнага ліку прасцейшых аналітычных аперацый. Напр., калі $M'_y = N'_x$, тады ўсе рашэнні $M(x,y)dx + N(x,y)dy = 0$ даюць формула $\int M(x,y)dx + N(x,y)dy = c$, дзе c — адвольная пастаянная. Калі Д.ў. зададзена з дапамогай аналітычных функцый, тады рашэнне выяўляецца таксама аналітычнай функцыяй, раскладаецца ў ступенны рад каля кожнага неасаблівага пункта і знаходзіцца метадам неакрэсленых каэфіцыентаў. Вызначэнне рашэння Д.ў. ці сістэмы Д.у. $x'=f(t,x)$ з зададзенай пачатковай умовай $x(t_0) = x_0$ раўназначнае рашэнню інтэгральных ураўненняў тыпу: $x(t)=x_0+\int_{t_0}^{t} f\,[s,\ x(s)]\ ds$ (3). Калі f неперарыўная функцыя, то (3) мае хоць бы адно рашэнне. Калі, акрамя гэтага, неперарыўная f'_x, то рашэнне (3) адзінае і яго можна знайсці з дапамогай *ітэрацый*. Метад ітэрацый разам з метадам раздзялення пераменных, з метадам малога параметра і інш. ўжываецца і пры рашэнні Д.ў. з частковымі вытворнымі. Прыбліжанае рашэнне Д.ў. атрымліваюць, замяняючы ў Д.у. вытворныя адносінамі прыращэнняў і пераходзячы да ўраўненняў у канечных рознасцях. Тэорыя Д.ў. выкарыстоўваецца ў варыяцыйным злічэнні, у тэорыі аптымальных працэсаў, у тэорыі кіравання рухам і ў большасці раздзелаў прыкладной матэматыкі. Вывучэнне *краявых задач* для Д.у. з частковымі вытворнымі — гал. частка матэм. фізікі.

На Беларусі развіццё тэорыі Д.у. звязана з імем М.П.*Яругіна*; распрацоўка новых раздзелаў тэорыі Д.у., арыентаваных на тэорыю кіравання, пачата ў 1966 Я.А.*Барбашыным*. Даследаванні па Д.у. вядуцца ў Ін-це матэматыкі Нац. АН Беларусі, БДУ і інш. (І.В.*Гайшун*, М.А.*Ізобаў*, Э.І.*Груда*, Ф.М.*Кірылава*, В.І.*Карзюк* і інш.). У Мінску выдаецца міжнар. навуковы час. *«Дифференциальные уравнения»*.

Літ.: Еругин Н.П. Книга для чтения по общему курсу дифференциальных уравнений. 3 изд. Мн., 1979; Ягож. Линейные системы обыкновенных дифференциальных уравнений с периодическими и квазипериодическими коэффициентами. Мн., 1963; Барбашин Е.А. Введение в теорию устойчивости. М., 1967.

Ю.С.Багданаў, М.А.Ізобаў.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ТАР, тое, што *дыферэнцавальнае прыстасаванне*.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЦЫЯ (франц. différentiation ад лац. differentia розніца, адрозненне), раздзяленне, расчляненне, расслаенне цэлага на розныя часткі, формы і ступені.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЦЫЯ МА́ГМЫ, сукупнасць фіз.-хім. працэсаў, у выніку якіх з магмы ўзнікаюць горныя пароды рознага хім. саставу або з колькаснымі суадносінамі адных і тых жа мінералаў. Асн. фактары Д.м.: змена тэрмадынамічных умоў, гравітацыя, асіміляцыя і інш. Адрозніваюць крышталізацыйную дыферэнцыяцыю (раздзяленне цвёрдых фаз у працэсе крышталізацыі) і ліквацыйную (раздзяленне расплаву на 2 вадкія фазы, якія не змешваюцца, аддзяленне лятучых і інш. форм).

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЦЫЯ МОЎ, працэс, у выніку якога з першасна адзінай мовы ўтвараецца дзве ці некалькі роднасных моў. Так, з адносна адзінай стараж.-рус. (усх.-слав.) мовы ўзніклі бел., рус. і ўкр. мовы, з народнай (вульгарнай) латыні — раманскія мовы (італьян., франц., ісп., партуг., рум. і інш.). Д.м. адбываецца на ўсіх *узроўнях мовы*, ахоплівае розныя складаныя з'явы (гукі, словы, грамат. правілы, стылістычныя мадэлі і інш.). Вынікае з своеасаблівасцей ўнутр. развіцця першасна адзінага матэрыялу ў розных рэгіёнах (напр., перад галосным «е» мяккімі сталі зычныя ў бел. і рус. мовах, цвёрдымі — ва ўкраінскай). Узаемазвязанасць моўных змен вядзе да паглыблення Д.м. Так, у бел. і рус. мовах націскны «е» пасля мяккага і не перад мяккім ператвараўся ў «о» («ё»), ва ўкр. мове такога ператварэння не адбылося, таму што зычны перад «е» заставаўся цвёрдым (напр., бел. «вясёлы», рус. «весёлый» — укр. «веселий»). Пэўная колькасць адрозненняў узнікала шляхам дастасавання выходнага матэрыялу да асаблівасцей інш. моў, з якімі кантактавалі гаворкі першасна адзінай мовы (напр., пэўныя рысы рум. мовы, што адрозніваюць яе ад інш. раманскіх моў, узніклі пад уздзеяннем слав. і некаторых інш. гавораў балканскага арэала). Д.м. разам з інтэграцыяй моў разглядаюцца як асн. шляхі знешнелінгвістычнага развіцця моў.

А.Я.Супрун.

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́ЦЫЯ САЦЫЯ́ЛЬНАЯ, працэс расслаення грамадства на асобныя, звязаныя паміж сабой, але адносна самаст. сац. групы. Існуюць розныя навук. падыходы вызначэння крытэрыяў Д.с. Г.Спенсер вылучаў эканам. фактар — падзел працы і яе вынікаў. М. Вебер звязваў паглыбленне неаднароднасці грамадства з працэсамі рацыяналізацыі каштоўнасцей і адносін паміж людзьмі. Прадстаўнікі сучаснай зах. структурна-функцыян. школы (Т.Парсанс) асаблівую ўвагу звяртаюць на сац. структуру, розныя віды дзейнасці, неабходныя для самазахавання грамадскай сістэмы. Матэрыяліст. сацыялогія падставай для Д.с. лічыць развіццё грамадскай вытв-сці, падзел працы, узнікненне рамёстваў, гандлю, прыватнай уласнасці, манагамнай сям'і, дзяржавы і інш. Важнымі праявамі і наступствамі Д.с. з'яўляюцца гіст. тыпы грамадства, сац. слаі, групы і інш. На сучасным этапе Д.с. звязана з навук.-тэхн. рэвалюцыяй і інфарматызацыяй грамадства. Д.с. — складаны і супярэчлівы працэс, які можа прывесці да сац. няроўнасці, негатыўна адбіцца на развіцці грамадства. Адна з форм Д.с. — *сацыяльная стратыфікацыя*.

В.І.Боўш.

ДЫФІЛАБАТРЫЁЗЫ, інвазійныя хваробы чалавека і жывёл (*гельмінтозы*), якія выклікаюцца стужачнымі чарвякамі з роду Diphyllobothrium. Пашыраны ўсюды. На Беларусі асн. ўзбуджальнік Д. — стужачнік шырокі (D. latum). У цыкле развіцця ўзбуджальнікаў ролю прамежкавых гаспадароў выконваюць рачкі, рыбы, амфібіі, рэптыліі. Жывёлы і чалавек заражаюцца пры ўжыванні недастаткова праваранай і прасоленай рыбы. У чалавека хвароба выяўляецца энтэрытам, анеміяй, алергіяй, бяссонніцай, галаўным болем. У жывёл на Д. хварэюць сабакі, пушныя звяры, свінні і інш. Пры значнай інвазіі жывёлы знясільваюцца, адстаюць у росце і развіцці, у іх настае анемія, парушаецца дзейнасць страўнікава-кішачнага тракту, нерв. сістэмы.

ДЫФІРА́МБ (грэч. dithyrambos), першапачаткова харавая культавая песня ў Стараж. Грэцыі ў гонар бога Дыяніса (Вакха), пазней — літ. форма, блізкая да *оды* ці *гімна*. У новай еўрап. л-ры мае пераймальны характар («Дыфірамб Пегасу» А.Сумарокава). У стараж.-бел. л-ры блізкія да Д. *панегірыкі*. У пераносным сэнсе Д. — перабольшаная пахвала, захапленне ўслаўленнем.

ДЫФРАКЦЫ́ЙНАЯ РАШО́ТКА, аптычная прылада, якая мае вял. колькасць элементаў (шчылін, штрыхоў або люстраных палосак) у непразрыстым экране.

Адрозніваюць рэгулярныя Д.р. (элементы размешчаны перыядычна) і нерэгулярныя Д.р. (элементы размешчаны хаатычна, напр., *галаграма*). Асн. характарыстыкі Д.р. — перыяд (адлегласць паміж суседнімі элементамі), *дысперсія* і *раздзяляльная здольнасць*. Д.р. бываюць плоскія і сферычныя, адбівальныя (з ступеньчатым профілем элементаў наз. эшэлетамі) і празрыстыя. Праходзячы праз Д.р. або адбіваючыся ад яе, святло раскладаецца на шэраг спектраў (гл. *Дыфракцыйныя спектры*). Уласцівасці Д.р. маюць крышталі, што служаць прасторавай Д.р. для рэнтгенаўскіх прамянёў, а таксама паверхні з вял. колькасцю штучных або натуральных штрыхоў (грамафонныя дыскі, пяруны пёры, рыбная луска і інш.), на якіх адбываецца *дыфракцыя святла*. Д.р. выкарыстоўваюцца як асн. элемент спектральных прылад, як аптычныя датчыкі лінейных і вуглавых перамяшчэнняў, палярызатары і фільтры інфрачырвонага выпрамянення і інш. *К.М.Грушэцкі.*



Да арт. **Дыфракцыйная рашотка.** Перыядычная структура (разрэз пры моцным павелічэнні) і схема дзеяння празрыстай (*а*) і абвівальнай (*б*) дыфракцыйнай рашоткі: d — перыяд рашоткі; 1 — падаючыя і 2 — дыфрагаваныя прамяні.

ДЫФРАКЦЫ́ЙНЫЯ СПЕ́КТРЫ, спектры эл.-магн. выпрамянення, атрыманыя пры дапамозе *дыфракцыйнай рашоткі*.

Пры праходжанні монахраматычнага пучка святла даўжыні хвалі λ праз дыфракцыйную рашотку з перыядам *d* утвараюцца максімумы, становішча якіх вызначаецца ўмовай $d(\sin\alpha+\sin\beta) = m\lambda$, дзе α — вугал падзення, β — вугал дыфракцыі, $m = 0, \pm 1, \pm 2, \pm 3, \ldots$ — парадак спектра. Пры дыфракцыі монахраматычнага святла кожнаму значэнню m адпавядае спектральная лінія M_1, у выпадку падзення на рашотку белага святла для кожнай даўжыні хвалі λ атрымліваецца свой набор спектральных ліній M_2, г. зн. выпрамяненне раскладаецца ў спектр па магчымых значэннях *m*. Пры гэтым інтэнсіўнасць спектральных ліній рэзка памяншаецца пры павелічэнні парадку спектра.

ДЫФРА́КЦЫЯ РЭНТГЕ́НАЎСКІХ ПРАМЯНЁЎ, з'ява, што выяўляецца пры пругкім рассеянні рэнтгенаўскіх прамянёў крышталямі (або малекуламі вадкасцей і газаў), пры якім з першаснага пучка прамянёў узнікаюць другасныя адхіленыя пучкі той жа даўжыні хвалі.

Д.р.п. эксперыментальна выяўлена ням. фізікамі М.Лаўэ, В.Фрыдрыхам і П.Кніпінгам (1912) як доказ хвалевай прыроды рэнтгенаўскіх прамянёў. Крышталь з'яўляецца натуральнай трохмернай дыфракцыйнай рашоткай (адлегласці паміж атамамі аднаго парадку з даўжынёй хвалі λ); напрамак дыфракцыйных максімумаў у агульным выпадку падпарадкоўваецца ўмовам Лаўэ: $a(\cos\alpha - \cos\alpha_0) = h\lambda$, $b(\cos\beta - \cos\beta_0) = k\lambda$, $c(\cos\gamma - \cos\gamma_0) = l\lambda$, дзе *a*, *b*, *c* — памеры крышт. рашоткі, α_0, β_0, γ_0 — вуглы, што ўтварае падаючы прамень, α, β, γ — рассеяны прамень з восямі крышталя, *h*, *k*, *l* — цэлыя лікі (індэксы Мілера). Дыфракцыйную карціну называюць на нерухомым крышталі з выкарыстаннем поліхраматычнага выпрамянення (Лаўэ метад), пры вярчэнні або ваганнях крышталя, а таксама на полікрышталях пры асвятленні монахраматычным выпрамяненнем (гл. *Дэбая—Шэрэра метад*). Д.р.п. выкарыстоўваецца для даследаванняў атамнай структуры рэчыва, рашэння задач матэрыялазнаўства, у рэнтгенаўскай спектраскапіі. Гл. таксама *Рэнтгенаўскі структурны аналіз*, *Рэнтгенаграфія матэрыялаў*.

Літ.: Иверонова В.И., Ревкевич Г.П. Теория рассеяния рентгеновских лучей. 2 изд. М., 1978. *М.М.Аляхновіч.*

ДЫФРА́КЦЫЯ СВЯТЛА́, з'ява агінання святлом контураў непразрыстых цел, якая прыводзіць да парушэння законаў *геаметрычнай оптыкі*. У больш шырокім сэнсе Д.с. — сукупнасць эфектаў, якія назіраюцца пры распаўсюджванні святла ў асяроддзі, з яўна выражанымі неаднароднасцямі.

Д.с. тлумачыцца праяўленнем хвалевых уласцівасцей святла і адбываецца, калі святло праходзіць праз вузкія шчыліны і адтуліны ў непразрыстых экранах ці каля краёў непразрыстых цел (памеры перашкод параўнальныя з даўжынёй хвалі святла). Дыфракцыйная карціна з'яўляецца вынікам інтэрферэнцыі дыфрагаваных хваль і вызначаецца суадносінамі паміж памерамі перашкод ці адтулін і даўжынёй хвалі святла і характарызуецца адпаведным размеркаваннем інтэнсіўнасці. Разлік найпрасцейшых дыфракцыйных карцін



Да арт. **Дыфракцыйныя спектры.** Схема ўтварэння спектраў пры дапамозе празрыстай дыфракцыйнай рашоткі.



Да арт. **Дыфракцыя святла.** Размеркаванне інтэнсіўнасці (1) і дыфракцыйная карціна (2) пры дыфракцыі Фраўнгофера на вузкай шчыліне шырынёй b, φ — вугал дыфракцыі.

Да арт. **Дыфракцыя святла.** Дыфракцыйная карціна пры дыфракцыі Фрэнеля на круглай адтуліне (1) і круглым экране (2).

робіцца на аснове *Гюйгенса—Фрэнеля прынцыпу*. Пры Д.с. ад кропкавай крыніцы (сферычная хваля) на круглай адтуліне ці круглым экране (дыфракцыя Фрэнеля) назіраецца чаргаванне светлых і цёмных кольцаў (дыфракцыйны відарыс перашкоды). Пры дыфракцыі плоскай светлавой хвалі на вузкай шчыліне (дыфракцыя Фраўнгофера) назіраецца чаргаванне светлых і цёмных палос (дыфракцыйны відарыс крыніцы святла). Д.с. на дыяфрагмах і аправах аб'ектываў абмяжоўвае *раздзяляльную здольнасць* аптычных прылад (мікраскопаў, тэлескопаў і інш.). На Д.с. заснавана дзеянне *дыфракцыйных рашотак*, узнаўленне галаграфічных відарысаў і інш. выкарыстанні *галаграфіі*.

Літ.: Степанов Б.И. Введение в современную оптику: Основные представления оптич. науки на пороге XX в. Мн., 1989. С. 109—142. *К.М.Грушэцкі.*

ДЫФРА́КЦЫЯ ХВАЛЬ, з'ява адхілення хваль ад прамалінейнага распаўсюджвання ў асяроддзях з рэзка выражанымі неаднароднасцямі (напр., з перашкодамі). Пры гэтым хвалі агінаюць перашкоды і трапляюць у вобласць геам. ценю. Прырода Д.х. тлумачыцца на аснове *Гюйгенса—Фрэнеля прынцыпу*.

Д.х. найб. выразна праяўляецца ў выпадках, калі памеры перашкод параўнальныя з даўжынёй хвалі λ. Таму дыфракцыя гукавых хваль ($\lambda\sim1$ см), паверхневых хваль на вадзе ($\lambda\sim1$ м) і радыёхваль ($\lambda\sim100$ м і больш) назіраецца ў натуральных умовах, а *дыфракцыя святла* ($\lambda\sim10^{-6}$ — 10^{-7} м) патрабуе спец. умоў (вузкія шчыліны, адтуліны і інш.). Гл. таксама *Дыфракцыя рэнтгенаўскіх прамянёў*, *Дыфракцыя часціц*. *К.М.Грушэцкі.*

ДЫФРА́КЦЫЯ ЧАСЦІ́Ц, рассеянне электронаў, нейтронаў, атамаў і інш. мікрачасціц крышталямі або малекуламі вадкасцей і газаў з утварэннем чаргаваных максімумаў і мінімумаў у інтэнсіўнасці рассеяных мікрачасціц.

Максімумы і мінімумы ў дыфракцыйнай карціне размяркоўваюцца ў адпаведнасці з унутр. будовай рассейвальнага асяроддзя. Д.ч. аналагічная *дыфракцыі святла* і пацвярджае квантавую прыроду мікрачасціц (гл. *Карпускулярна-хвалевы дуалізм*). Паводле *квантавай механікі* свабодны рух часціцы з масай m і скорасцю v (энергіяй $E=\frac{mv^2}{2}$; пры ўмове $v<<c$, дзе c — скорасць святла ў вакууме) можна разглядаць як плоскую хвалю (гл. *Хвалі дэ Бройля*) з даўжынёй хвалі $\lambda=\frac{h}{mv}=\frac{h}{\sqrt{2mE}}$, дзе h — *Планка пастаянная*. Пры ўзаемадзеянні часціцы з атамамі ці малекуламі рассейвальнага асяроддзя мяняецца яе энергія і характар распаўсюджання звязанай з ёй хвалі, што адбываецца ў адпаведнасці з агульнымі прынцыпамі *дыфракцыі хваль*. Д.ч. выкарыстоўваецца пры даследаванні паверхні цвёрдых цел, будовы крышталёў і складаных малекул. *А.І.Болсун.*

ДЫФТО́НГ (ад *ды...* + грэч. phthongos голас, гук), складаны галосны гук, які ўключае складаўтваральны і нескладаўтваральны элементы ў адным *складзе*. Звычайна Д. маюць большую працягласць, чым *мафтонгі*. Адрозніваюцца Д.: у з ы х о д н ы, у якім складаўтваральным кампанентам з'яўляецца другі элемент (напр., франц. [ie͡] pied); с ы х о д н ы, калі складаўтваральны кампанент — першы элемент (напр., ням. [ae͡] Leid, англ., [ai͡] my). У бел. мове ёсць Д. [оў] і [ie͡] толькі ў дыялектах на Пд Беларусі. Вымаўляюцца ў закрытых складах замест «о» і «е», а таксама замест «е», што паходзіць з «ъ»: напр., кбўнь, сем, лета (конь, сем, лета).

ДЫФТЭРЫ́Я (ад грэч. diphtherion скурка, плеўка), інфекцыйная хвароба чалавека з фібрынозным (плеўкавым) запаленнем і агульнай інтаксікацыяй.

Узбуджальнік Д. адкрыты ням. бактэрыёлагамі Э.Клебсам і Ф.Лёфлерам у 1883. Крыніца інфекцыі — хворыя на Д. і бацыланосьбіты. Перадаецца паветрана — кропельным шляхам. Адрозніваюць Д. зева, носа, гартані, вачэй, вонкавых палавых органаў (у дзяўчынак); бываюць камбінаваныя формы. Найчасцей бывае Д. зева (у 60—70%; лакалізаваная, пашыраная і таксічная). Прыкметы: пасля інкубацыйнага перыяду (2—14 дзён) т-ра цела 38 °С, паніжэнне апетыту, боль галавы і пры глытанні, пачырваненне, шэра-белыя плеўкі на слізістай абалонцы. Ускладненні: рэзкае звужэнне прасвету гартані (стэноз), расстройствы нерв. і сардэчна-сасудзістай сістэм.

Лячэнне: шпіталізацыя, процідыфтэрыйная сываратка; іншы раз — хірургічнае. Абавязковыя прышчэпкі супраць Д. коклюшна-дыфтэрыйна-слупняковай (КДС) вакцынай. *П.Я.Новікаў.*

ДЫФУ́ЗАР, 1) частка канала (трубы), у якой запавольваецца рух і павышаецца ціск газу або вадкасці. Ёсць у аэрадынамічных трубах, паветрана-рэактыўных рухавіках, некаторых відах кампрэсараў, помпаў і інш. 2) Прыстасаванне да фотаапарата або фотапавелічальніка, прызначанае для «змякчэння» (паніжэння рэзкасці) выявы. Звычайна гэта плоскапаралельная шкляная пласцінка з прамавугольнай сеткай ці канцэнтрычнымі кругамі або вузкія палоскі шкла. 3) Папяровая мембрана канічнай формы для павелічэння акустычнай аддачы гучнагаварыцеля. 4) Апарат для вышчалочвання ў вытв-сці гліназемы. 5) Апарат для экстракцыі растваральных рэчываў (гл. *Дыфузійны апарат*).



Да арт. **Дыфракцыя хваль**. Праходжанне плоскай гукавой хвалі праз адтуліны розных памераў.



Да арт. **Дыфракцыя часціц**. Дыфракцыйная карціна, утвораная пучком электронаў пры праходжанні іх праз монакрышталёвую плёнку монагідрату хлорыстага барыю.

ДЫФУЗІ́ЙНАЯ ЗВА́РКА, зварка металаў, пластмас і інш. матэрыялаў, заснаваная на выкарыстанні *дыфузіі*. Звычайна робіцца ў вакууме, часам у атмасферы ахоўных газаў (аргону, вадароду, гелію), вадкіх асяроддзях.

Пры Д.з. дэталі змяшчаюць у зварачную герметычную камеру з разрэджаннем 10—1 кПа, награюць да 600—800 °С (без расплаўлення кантаў) і сціскаюць. Пры гэтым у паверхневых слаях дэталей, што кантактуюць, адбываецца інтэнсіўная ўзаемная дыфузія атамаў, за кошт якой матэрыялы злучаюцца. Д.з. выкарыстоўваецца ў электроннай і паўправадніковай прам-сці, дакладным машынабудаванні і інш.

ДЫФУЗІ́ЙНАЯ МЕТАЛІЗА́ЦЫЯ, гл. ў арт. *Металізацыя*.

ДЫФУЗІ́ЙНЫ АПАРА́Т, д ы ф у з а р, э к с т р а к т а р, апарат для здабывання растваральных рэчываў з цвёрдай здробненай сыравіны метадам *дыфузіі*. Бываюць бесперапыннага (вертыкальныя, нахіленыя і гарызантальныя; ратацыйныя, стужачныя і шнэкавыя) і перыядычнага (складаюцца з герметычна закрытых пасудзін) дзеяння. У больш дасканалых Д.а. бесперапыннага дзеяння растваральнік (вада) абагачаецца карыснымі рэчывамі, якія вылучаюцца пры сустрэчным руху (супрацьцёку) растваральніку і здробненай сыравіны. Пашыраны пераважна ў цукр. вытв-сці, дзе выкарыстоўваюцца для атрымання цукр. соку з бурачнай стружкі, а таксама ў кансервавай, вітаміннай і інш. вытв-сцях.

ДЫФУЗІ́ЙНЫЯ ПАКРЫ́ЦЦІ, ахоўныя пакрыцці, створаныя вадка- або газафазным насычэннем (у выніку *дыфузіі*) паверхні метал. і неметал. вырабаў адным або некалькімі хім. элементамі (борам, хромам і інш.). Выкарыстоўваюцца ў хім. машынабудаванні, авіяц. і касм. тэхніцы і інш.

Д.п. — раўнамерныя па таўшчыні, моцна злучаныя з матэрыялам асновы. Ахоўваюць

вырабы ад зносу, стомленаснага разбурэння, акіслення пад уздзеяннем вадкіх і газавых асяроддзяў. Атрымліваюць *азатаваннем*, *барыраванием*, *берылізацыяй*, *нітрацэментацыяй*, *храміраванием* і інш.

ДЫФУ́ЗІЯ (ад лац. diffusio распаўсюджванне, расцяканне, рассейванне), пераносрэчыва за кошт цеплавога руху часціц (малекул, атамаў і інш.) у адна- ці шматкампанентным газавым або кандэнсаваным асяроддзі; узаемнае пранікненне рэчываў, якія мяжуюць адно з адным. Адбываецца пры наяўнасці градыента канцэнтрацыі і вядзе да раўнамернага размеркавання рэчыва па ўсім аб'ёме сістэмы.

Д. ўласціва газам, вадкасцям і цвёрдым целам. Працякае з рознай скорасцю (найб. хутка ў газах), што абумоўлена характарам цеплавога руху. Дыфундзіраваць могуць заіслыя часцінкі прымесей (з прычыны *броўнаўскага руху*) і часціцы самога асяроддзя (самадыфузія), хім. састаў якога застаецца нязменны. Узнікае і пры адсутнасці градыента канцэнтрацыі: пад уплывам градыента т-ры (тэрмадыфузія), пры ўздзеянні знешняга эл. поля (электрадыфузія) ці градыента ціску (барадыфузія). Вызначае механізм і кінетыку хім. рэакцый, шматлікіх фіз.-хім. працэсаў і з'яў (мембранных, выпарэння, гарэння, крышталізацыі і інш.); з'яўляецца асновай многіх працэсаў жыццядзейнасці жывёл і раслін (Д. кісларoду з лёгкіх у кроў, паглынанне пажыўных рэчываў, усмоктванне прадуктаў стрававання з кішэчніка і інш.), тэхнал. аперацый (гомагенізацыі сплаваў, зварцы металаў, дубленне скуры і футра, афарбоўкі валокнаў і інш.).

Літ.: Овчинников А.А., Тимашев С.Ф., Белый А.А. Кинетика диффузионно-контролируемых химических процессов. М., 1986; Чалых А.Е. Диффузия в полимерных системах. М., 1987. *У.С.Камароў.*

ДЫХАГА́МІЯ (ад грэч. dicha асобна, паасобку + *...гамія*), розначасовае выспяванне пыльнікаў і рыльца кветкі або органаў рознага полу ў споравых раслін. Адзін з механізмаў, які перашкаджае самаапыленню і садзейнічае перакрыжаванаму апыленню. Адрозніваюць пратандрыю, калі пыльнікі раскрываюцца раней, чым выспявае рыльца (напр., у большасці гваздзіковых, гераніевых і інш.), і пратагінію, калі раней выспявае рыльца кветкі (напр., у крыжакветных, ружавых і інш.), што бывае радзей. Тып Д. зрэдку можа залежаць ад умоў надвор'я (напр., у асаковых у гарачую вясну замест пратаганіі можа назіравацца пратандрыя).

ДЫХА́ЛЬНАЕ ГО́РЛА, гл. *Трахея.*

ДЫ́ХАЛЬНЫЯ КАРАНІ́, гл. *Пнеўматафоры.*

ДЫХА́ННЕ, сукупнасць працэсаў, якія забяспечваюць паступленне кісларoду ў арганізм, выкарыстанне яго ў акісляльна-аднаўленчых працэсах, выдаленне з арганізма вуглякіслага газу і некат. інш. канчатковых прадуктаў абмену рэчываў; адна з асн. жыццёвых функцый. Аснова Д. — спажыванне кісларoду жывымі клеткамі, якое суправаджаецца рэакцыямі дэгідрагенізацыі з пераносам вадароду ад арган. рэчываў (субстратаў) на кісларод з утварэннем вады (гэтыя рэакцыі ідуць у спец. структурах клеткі — мітахондрыях). Д. ажыццяўляецца пераважна за кошт акіслення вугляводаў. Мае 2 этапы: пачатковы (анаэробны), які адбываецца па тыпу гліколізу (цукры ў анаэробных умовах распадаюцца да піравінаграднай кіслаты) і канчатковы (аэробны), пры якім піравінаградная кіслата акісляецца да вуглякіслага газу і вады (цыкл Крэбса). Д. жывых арганізмаў узнікла на Зямлі, калі ў яе атмасферы з'явіўся кісларод.

У аднаклетачных і некат. шматклетачных жывёл абмен газаў паміж клеткамі і асяроддзем ажыццяўляецца шляхам дыфузіі праз паверхню цела. Больш высокаарганізаваныя жывёлы і чалавек маюць спец. органы дыхання і сістэму кровазвароту, у якой цыркулююць кроў і гемалімфа, здольныя звязваць кісларод і вуглякіслы газ (гл. *Гемаглабін*). Адрозніваюць Д. вонкавае, якое забяспечвае абмен газаў паміж лёгкімі і вонкавым асяроддзем, перанос газаў крывёю (гл. *Газаабмен*), і тканкавае. У насякомых кісларод паступае ў тканкі з сістэмы паветраносных трубачак — трахей. У многіх водных жывёл вонкавае Д. ажыццяўляецца паверхняй цела і шчэлепамі, якія маюць вял. сетку крывяносных сасудаў. Растворан ў вадзе кісларод дыфундзіруе ў кроў, якая цыркулюе ў сасудах шчэлепаў. У многіх рыб значную ролю адыгрывае кішэчнае Д., калі заглытваецца паветра і кісларод паступае ў кроў праз крывяносныя сасуды кішэчніка. У сухапутных жывёл вонкавае Д. забяспечваецца пераважна лёгкімі. У амфібій і інш. жывёл разам з лёгкімі функцыянуе скурнае Д. У птушак ёсць паветраныя мяшкі, якія злучаюцца з лёгкімі і мяняюць аб'ём пры лятальных рухах (палягчае Д. ў палёце). Вонкавае Д. забяспечваецца дыхальнымі рухамі (удыхам, выдыхам), колькасць якіх у стане спакою ў чалавека 16—20. Пры адным спакойным удыху чалавека ў лёгкія паступае каля 350 см³ паветра (гл. *Жыццёвая ёмістасць лёгкіх*), мінутная лёгачная вентыляцыя ў стане спакою складае 4—8 л. Прычына абмену паветра ў альвеолах лёгкіх — рознасць парцыяльнага ціску. Рэгуляцыя Д. ў чалавека і пазваночных жывёл адбываецца дыхальным цэнтрам. Аснова тканкавага Д. — акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі. Пры іх вызваляецца энергія, якая ідзе на аднаўленне жывога рэчыва, рост і развіццё тканак, скарачэнне мышцаў, сакрэцыю залоз і інш. (гл. *Акісленне біялагічнае*). Пры парушэннях Д. і механізмаў яго рэгуляцыі ўзнікаюць змяненні газавага саставу крыві. Пры парушэннях або адсутнасці Д. робяць *дыханне штучнае.*

ДЫХА́ННЕ РАСЛІ́Н, працэс акісляльнага распаду вугляводаў (або інш. дыхальных субстратаў) да дыяксіду вугляроду (CO_2) і вады, які ідзе з паглынаннем кісларoду. Пры гэтым вызваляецца энергія, што раней назапашваецца пры *фотасінтэзе*, і выкарыстоўваецца на ўтварэнне багатых энергіяй злучэнняў (часцей у форме АТФ). У ніжэйшых раслін абмен газаў пры дыханні ідзе шляхам дыфузіі праз паверхню клетак, у вышэйшых раслін — праз міжклетнікі, якія пранізваюць усё цела. Найб. інтэнсіўнасцю дыхання вызначаюцца маладыя, хутка растучыя органы і тканкі. У расліны найб. актыўна дыхаюць рэпрадукцыйныя органы, потым лісце, слабей — сцёблы і карані. З заканчэннем перыяду актыўнага росту Д.р. аслабляецца, што звязана з працэсамі старэння пратаплазмы.

ДЫХА́ННЕ ШТУ́ЧНАЕ, прыёмы штучнай вентыляцыі паветра ў лёгкіх. Неабходнасць Д.ш. ўзнікае пры адсутнасці дыхання або яго парушэннях, якія пагражаюць жыццю хворага. Д.ш. — неабходная мера першай дапамогі тапельцам, пры ўдушэнні, паражэнні эл. токам, цеплавым і сонечным ударах, некат. атручэннях. У выпадку клінічнай смерці або пры адсутнасці самаст. дыхання і сэрцабіцця Д.ш. праводзяць адначасова з масажам сэрца. Д.ш. робіцца спосабам з рота ў рот або з рота ў нос. Перад пачаткам Д.ш. рот і нос пацярпелага ачышчаюцца ад слiны, слізі, ірвотных мас, зямлі, цела вызваляюць ад усяго, што перашкаджае рухам. Аснова метаду Д.ш. — рытмічнае ўдзіманне паветра ў дыхальныя шляхі пацярпелага. Для Д.ш. выкарыстоўваюць таксама спец. апараты. Д.ш. робяць да аднаўлення самаст. дыхання; пры паяўленні прыкмет смерці (трупныя плямы, скарчанеласць) спыняюць.

ДЫХАТАМІ́ЧНАЕ ГАЛІНАВА́ННЕ, гл. ў арт. *Галінаванне.*

ДЫХАТАМІ́Я (грэч. dichotomia ад dicha на дзве часткі + tomē разрэз, сячэнне), тып галінавання раслін, пры якім вось падзяляецца на 2 новыя, звычайна аднолькава развітыя галінкі (гл. *Галінаванне*). Д. ўласціва і некат. беспазваночным жывёлам (напр., дыхатамічнае дзяленне кішэчнаполасцевых).

ДЫХЛОРДЫФЕНІЛТРЫХЛОРЭТА́Н, тое, што *ДДТ.*

ДЫХЛОРЭТА́Н, этылендыхларыд, 1,2-дыхлорэтан, хлорвытворнае этану, $ClCH_2—CH_2Cl$. Бясколерная вадкасць з саладкаватым пахам, $t_{кіп}$ 83,47 °С, шчыльн. 1253 кг/м³ (20 °С). Добра растваральнік ў этаноле, ацэтоне, бензоле, эфіры. Атрымліваюць простым ці акісляльным хлараваннем этылену. Выкарыстоўваюць як сыравіну ў вытв-сці вінілхларыду, этылендыяміну, этыленгліколю, полісульфідных каўчукоў, як растваральнік, фумігант. Таксічны: выклікае псіхічныя расстройствы, галавакружэнне, ірвоту, пашкоджанне нырак, печані, ГДК (для пары) 10 мг/м³, у паветры населеных месцаў 1 мг/м³ (сярэднясутачная). Гл. таксама *Галагенавытворныя вуглевадародаў.*

ДЫХРАІ́ЗМ (ад грэч. dichroos двухколерны), розная афарбоўка аднавосевых крышталёў, якім характэрна *падвойнае праменепераламленне*, пры праходжанні святла ўздоўж аптычнай восі і перпендыкулярна да яе. Напр., крышталь апатыту, які асветлены белым святлом, будзе светла-жоўтым, калі глядзець уздоўж восі, і зялёным — упоперак да яе; пры інш. напрамках назірання крышталь афарбаваны ў які-н. прамежкавы колер. Гл. таксама *Плеахраізм.*

ДЫХРАМА́ТЫ, солі дыхромавай к-ты $H_2Cr_2O_7$. Крышт. рэчывы аранжава-

жоўтага колеру (напр., Д. натрыю $Na_2Cr_2O_7$, $t_{пл}$ 320 °С, т-ра раскладання 400 °С). Растваральнікі. Выкарыстоўваюць як кампаненты выбуховых рэчываў, дубільнікі ў гарбарнай прам-сці, пратраву ў тэкст. прам-сці, для адбельвання маслаў, воску, атрымання арган. злучэнняў і інш. Таксічныя, напр. раствор Д. калію разбурае скурныя покрывы і храстковыя тканкі, ГДК 0,01 мг/м^3 [у пераліку на аксід хрому (VI) CrO_3].

ДЫХТА́У, адна з гал. вяршынь Бакавога хр. ў цэнтр. частцы Вял. Каўказа, у Кабардзіна-Балкарыі, паблізу мяжы з Грузіяй. Выш. 5203 м. Складзена з крышт. парод. Лёдавік. Альпінізм.

ДЫХТО́ЎНАСЦІ ВЫМЯРА́ЛЬНІК, прылада для вымярэння эфектыўнай *дыхтоўнасці* і інш. параметраў вагальных контураў. Бывае аналагавы і лічбавы; мае калібраваны генератар ваганняў з вымяральным вагальным контурам і індыкатар рэзанансу. Прынцып дзеяння заснаваны на вымярэнні суадносін паміж напружаннем на ўзорным кандэнсатары пры рэзанансе і напружаннем, якое пададзена на контур, або на падліку колькасці перыядаў затухальных свабодных ваганняў у контуры (лічбавыя прылады; гл. *Затуханне ваганняў*). Выкарыстоўваецца для вымярэння параметраў пасіўных (шпуль індуктыўнасці, кандэнсатараў, рэзістараў і інш.) і актыўных (варыкапы, тунэльныя дыёды і інш.) элементаў радыёэлектронных схем. *А.П.Ткачэнка.*

ДЫХТО́ЎНАСЦЬ вагальнай сістэмы, колькасная характарыстыка рэзанансных уласцівасцей *вагальнай сістэмы*. Паказвае, у колькі разоў амплітуда вымушаных ваганняў пры рэзанансе перавышае амплітуду вымушаных ваганняў удалечыні ад рэзанансу; характарызуе выбіральнасць і раздзяляльную здольнасць вагальнай сістэмы: чым большая Д., тым меншыя страты энергіі за перыяд ваганняў, тым вышэй рэзанансны водгук сістэмы (у параўнанні з нерэзанансным) і тым больш блізкія частоты можна выдзяляць паасобку.

У аснову вымярэнняў Д. (гл. *Дыхтоўнасці вымяральнік*) могуць быць закладзены розныя прынцыпы: Д. (Q) можна таксама выразіць як дзель рэзанаснай частаты ω да шырыні рэзанаснай крывой $\Delta\omega$($Q = \omega/\Delta\omega$); дзель поўнай энергіі W, назапашанай у вагальнай сістэме, да сярэдняй магутнасці страт P за перыяд ваганняў ($Q = \omega W/P$) і інш. Напр., вагальны контур мае Д. да 100, камертон — да 10^4, пласцінка п'езакварцу і аб'ёмны рэзанатар ЗВЧ ваганняў — да 10^5. *А.П.Ткачэнка.*

ДЫ́ЦГЕН (Dietzgen) Іосіф (9.12.1828, г. Бланкенбург, Германія — 15.4.1888), нямецкі філосаф. Самастойна авалодаў асновамі філас. навукі і развіваў матэрыяліст. дыялектыку. Знаходзіўся пад уплывам ідэй Л.Феербаха, К.Маркса і Ф.Энгельса. Жыў і працаваў у Германіі, Расіі і ЗША. Асн. працы «Сутнасць галаўной работы чалавека» (1869), «Экскурсія сацыяліста ў галіну тэорыі пазнання» (1887), «Аквізіт філасофіі» (1895) і інш. прысвечаны гнасеалогіі, якую Д. лічыў тэарэт. падставай даследавання сац.-эканам. праблем. Цэнтр. месца ў яго філас. поглядах займае выснова, што мысліцельная здольнасць чалавека з'яўляецца прыроднай функцыяй яго мозга. Вывучаў таксама формы, ступені і супярэчнасці працэсу пазнання, магчымасці адлюстравання бясконцага універсуму ў формах адносна і канкрэтнай ісціны.

Тв.: Рус. пер. — Избр. философские сочинения. М., 1941. *В.І.Боўш.*

ДЫЦУКРЫ́ДЫ, вугляводы — аліга-цукрыды, малекула якіх мае 2 астаткі *монацукрыдаў*, злучаных гліказіднай сувяззю. Падзяляюцца на неаднаўленчыя (*цукроза*, трэгалоза) і аднаўленчыя (*мальтоза*, *лактоза*, цэлабіёза). У злучэннях неаднаўленчых Д. удзельнічаюць абодва гліказідныя гідраксілы, у аднаўленчых злучэнне ажыццяўляецца паміж гліказідным гідраксілам аднаго астатку і спіртавым гідраксілам другога астатку, у малекуле захоўваецца адна напалову ацэтальная групоўка. Па здольнасці ўдзельнічаць у рэакцыях нагадваюць монацукрыды. Пашыраны ў прыродзе ў свабодным выглядзе, з'яўляюцца структурнымі кампанентамі малекул гліказідаў, аліга- і поліцукрыдаў.

ДЫЦЭ́НТРА, дыклітра (Dicentra), род кветкавых раслін сям. дымніцавых. Каля 20 відаў. Пашыраны ва Усх. Азіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі 2 інтрадукаваныя віды: Д. цудоўная (D. spectabilis, радзіма — Кітай, Карэя) і прыгожая, або амерыканская (D. formosa, радзіма — Паўн. Амерыка). Вырошчваюць у садах і кветніках. Размнажаюць дзяленнем кустоў і карэнішчаў.

Шматгадовыя травяністыя расліны з прамым разгалінаваным сцяблом і карэнішчам. Лісце трайчаста-раздзельнае, перыстарассечанае або складанае, зялёнае ці шызавата-зялёнае. Кветкі пляскатыя, сэрцападобныя (адсюль бытавая назва расліны — «разбітае сэрца»), пераважна ружовыя або пурпуровыя, у доўгіх аднабаковых гронках. Плод — каробачка. Дэкар. і лек. расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДЫ́ЭДР, двухграневая простая форма крышталёў з двайной воссю сіметрыі. Выкарыстоўваецца ў крышталяграфіі.

ДЫЭЛЕ́КТРЫКІ (ад *дыя...* + англ. electric электрычны), рэчывы, якія практычна не праводзяць электрычны ток і могуць палярызавацца ў знешнім эл. полі (гл. *Палярызацыя дыэлектрыкаў*). Бываюць цвёрдыя (напр., бурштын, слюда, шкло, эбаніт), вадкія (вада, трансформатарнае масла) або газападобныя (усе газы). Падзяляюцца на непалярныя (малекулы маюць сіметрычную будову і цэнтры «цяжару» дадатных і адмоўных зарадаў супадаюць), палярныя (малекулы пры адсутнасці знешняга эл. поля маюць адрозны ад 0 *дыпольны момант*) і іонныя крышталі (крышталічная рашотка з правільным чаргаваннем іонаў розных знакаў і ўтварэннем 2 іонных падрашотак). Адпаведна адрозніваюць электронную (дэфармацыйную), арыентацыйную (дыпольную) і іонную палярызацыю. Механізмы палярызацыі Д. розныя і залежаць ад характару хім. сувязей. Асн. характарыстыкі Д.: *дыэлектрычная пранікальнасць*, *дыэлектрычная ўспрыймлівасць* і эл. трываласць (гл. *Прабой дыэлектрыкаў*). У тэхніцы выкарыстоўваюцца як электраізаляцыйныя матэрыялы, у кандэнсатарах служаць для павелічэння ёмістасці; у паўправадніковай электроніцы (у т.л. мікраэлектроніцы) выкарыстоўваюцца дыэл. плёнкі (аморфныя, шклопадобныя, палімерныя) для ўтварэння структур метал—Д.—метал, метал—Д.—паўправаднік і інш. На аснове кантактаў у выглядзе тонкага слоя Д., які раздзяляе 2 звышправаднікі (кантакты Джозефсана; гл. *Джозефсана эфект*) створаны маламагутныя ЗВЧ генератары, хуткадзейныя элементы памяці ЭВМ, квантавыя інтэрферометры і інш.

На Беларусі даследаванні па фізіцы Д. пачаліся ў 1935 у БПІ (М.А.*Безбародаў*). З 1959 вядуцца ў Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нац. АН, Бел. політэхн. акадэміі і інш.

Літ.: Сканави Г.И. Физика диэлектриков (область слабых полей). М.; Л., 1949; Яго ж. Физика диэлектриков (область сильных полей). М., 1958; Рез И.С., Поплавко Ю.М. Диэлектрики: Основные свойства и применения в электронике. М., 1989. *А.У.Шэлег.*

ДЫЭЛЕКТРЫ́ЧНАЯ ПРАНІКА́ЛЬНАСЦЬ, велічыня, якая характарызуе здольнасць *дыэлектрыка* палярызавацца ў знешнім эл. полі. Уваходзіць у *Кулона закон* як велічыня, што паказвае, у колькі разоў змяншаецца сіла ўзаемадзеяння эл. зарадаў пры пераносе іх з вакууму ў дыэлектрык пры нязменнай адлегласці паміж імі. Для ізатропных дыэлектрыкаў Д.п. ε вызначаецца адным лікам (ε — скаляр), для анізатропных — сукупнасцю лікаў (ε — тэнзар). Нараўне з Д.п. ўласцівасці дыэлектрыкаў апісваюць *дыэлектрычнай успрыімлівасцю* x, якая звязана з ёй суадносінамі: $\varepsilon = x + 1$.

Д.п. — адна з асн. характарыстык дыэлектрыка, вызначаецца механізмам яго палярызацыі і залежыць ад палярызаванасці часціц (атамаў, малекул, іонаў), што ўваходзяць у яго склад. У непалярных дыэлектрыках Д.п. слаба залежыць ад т-ры; у палярных — залежнасць істотная, асабліва для *сегнетаэлектрыкаў*. Найб. пашыраныя метады вымярэння Д.п. заснаваны на вымярэнні ёмістасці кандэнсатара, запоўненага даследаваным дыэлектрыкам. Для газаў Д.п. роўна 1,0001—1,006, для вадкасцей — 1,8—81, для сегнетаэлектрыкаў — да 50000. *А.У.Шэлег.*

ДЫЭЛЕКТРЫ́ЧНАЯ ЎСПРЫ́ЙМЛІВАСЦЬ, велічыня, якая характарызуе *палярызацыю дыэлектрыка* пад уздзеяннем эл. поля. Колькасна Д.ў. — безразмерны каэф. прапарцыянальнасці x у

формуле $\vec{p} = \varepsilon_0 x \vec{E}$, дзе ε_0 — электрычная пастаянная, $\vec{E}$ — напружанасць эл. поля, $\vec{p}$ — *палярызаванасць* дыэлектрыка. Звязана з *дыэлектрычнай пранікальнасцю* суадносінамі: $\varepsilon = x + 1$ і мае з ёй аднолькавыя ўласцівасці.

ДЫЭЛЕКТРЫ́ЧНЫ ГІСТЭРЭ́ЗІС, запазненне змянення палярызаванасці дыэлектрыка і яе неадназначная залежнасць ад напружанасці знешняга эл. поля. Назіраецца ў сегнетаэлектрыках і антысегнетаэлектрыках. Гл. ў арт. *Сегнетаэлектрычны гістэрэзіс*.

ДЫЭЛЕКТРЫ́ЧНЫ НАГРЭ́Ў, награванне дыэлектрыкаў у пераменным эл. полі. Абумоўлены *дыэлектрычнымі стратамі*. Мае высокую хуткасць і раўнамернасць разагравання матэрыялаў з нізкай цеплаправоднасцю. Пры частотах да 300 МГц праводзіцца ў полі кандэнсатара; пры звышвысокіх частотах — у полі аб'ёмнага рэзанатара ці выпрамяняльніка; напружанасць эл. поля ў прамысл. установках да 3000 кВ/м. Выкарыстоўваецца для высушвання матэрыялаў (драўніны, паперы, керамікі і інш.), зваркі пластмас, награвання пластмас перад прасаваннем, пры склейванні драўніны і інш.

ДЫЭЛЕКТРЫ́ЧНЫЯ СТРА́ТЫ, частка энергіі пераменнага эл. поля, якая ў *дыэлектрыку* пераходзіць у цеплавую. Складаюцца са страт праводнасці (джоўлевы страты; гл. *Джоўля—Ленца закон*) і страт, абумоўленых актыўнай кампанентай току зрушэння ў дыэлектрыку; сегнетаэлектрыкі, акрамя таго, маюць страты на пераарыентацыю даменаў (гл. *Сегнетаэлектрычны гістэрэзіс*). У сінусаідальным полі характарызуюцца тангенсам вугла Д.с. $\mathrm{tg}\delta$, які вызначае долю эл. энергіі, што пераходзіць у цеплавую за 1 перыяд ваганняў эл. поля. Д.с. вымяраюцца, як правіла, разам з вымярэннем *дыэлектрычнай пранікальнасці* рэчыва. Змяншэнне страт мае важнае значэнне ў вытв-сці кандэнсатараў і эл.-ізаляцыйнай тэхніцы. Д.с. суправаджаюцца разаграваннем дыэлектрыка (дыэлектрычны нагрэў), што выкарыстоўваецца для высушвання матэрыялаў з малой цеплаправоднасцю (драўніны, паперы, керамікі і інш.).

А.У.Шэлег.

ДЫЭНЦЭФА́ЛЬНЫ СІНДРО́М, гіпаталамічны сіндром, комплекс сімптомаў, абумоўленых пашкоджаннем глыбінных аддзелаў галаўнога мозга (гіпаталамуса, гіпофіза). Бывае ад інфекцый, траўмаў і пухлін галаўнога мозга, хранічных хвароб печані, нырак, страўніка і інш. Прыкметы: парушэнне сну, тэрмарэгуляцыі, тлушчавага, водна-салявога, вугляводнага і інш. відаў абмену, дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы і залоз унутр. сакрэцыі — гіпофіза, палавых, шчытападобнай, наднырачнікаў, нязначныя арган. неўралагічныя сімптомы. Лячэнне тэрапеўтычнае.

Г.Дз.Сітнік.

ДЫЭТЫ́ЛАВЫ ЭФІ́Р, этылавы эфір, серны эфір, эфір, аліфатычны просты эфір, $H_5C_2OC_2H_5$. Бясколерная вадкасць са своеасаблівым пахам, $t_{кіп}$ 34,5 °С, шчыльн. 713,8 кг/м^3 (20 °С). Атрыманы ў 16 ст. В.Кордусам дэгідратацыяй этанолу ў прысутнасці сернай к-ты (гэтым спосабам карыстаюцца і цяпер).

Д.э. змешваецца са спіртам, бензолам і інш. арган. растваральнікамі, абмежавана — з вадой (6,5% пры 20 °С); выбухова- і вогненебяспечны (т-ра загарання -41 °С). У прам-сці атрымліваюць як пабочны прадукт пры вытв-сці этылавага спірту гідратацыяй этылену. Выкарыстоўваюць як растваральнік нітратаў цэлюлозы (у т.л. ў вытв-сці бяздымнага пораху), жывёльных і раслінных тлушчаў, прыродных і сінт. смол, алкалоідаў і інш.; экстрагент, анестэзіруючы сродак у медыцыне. Злёгку раздражняе дыхальныя шляхі, пры атручэнні настае ўзбуджэнне, потым санлівасць і страта прытомнасці, ГДК 300 мг/м^3.

Я.Г.Міляшкевіч.

ДЫЭТЫЛЕНГЛІКО́ЛЬ, дыгліколь, 2,2-дыгідроксіэтылавы эфір, просты эфір з канцавымі гідраксільнымі групамі, $(HOCH_2CH_2)_2O$.

Бясколерная вязкая гіраскапічная вадкасць без паху, салодкая на смак, $t_{кіп}$ 245,8 °С, шчыльн. 1116,1 кг/м^3 (20 °С). Змешваецца з вадой, спіртам, гліколямі, ацэтонам, хлараформам. Мае хім. ўласцівасці *гліколяў* і *эфіраў*. Выкарыстоўваюць як сыравіну ў вытв-сці поліурэтанаў, алігаэфіракрылатаў, складаных эфіраў, кампанент антыфрызаў, гідраўл. тармазных і змазачных вадкасцей, растваральнік нітратаў цэлюлозы, поліэфірных смол, асушальнік газаў і інш. Раздражняе скуру, уздзейнічае на ц.н.с. і ныркі (пры пападанні ўнутр), ГДК 10 мг/м^3, у вадзе вадаёмаў — 1 мг/л.

ДЫЭТЫЛЕНДЫАКСІ́Д, гл. *Дыаксан*.

ДЫЯ... (грэч. dia), прыстаўка, якая абазначае праходжанне праз што-н. ад пачатку і да канца ў прасторы і часе, поўнае завяршэнне дзеяння, раздзяленне, аддзяленне, напр., *дыягенез*, *дыяпаўза*, *дыяскоп*.

ДЫЯБА́З (ад грэч. diabasis пераход), поўнакрышталічная палеатыпная магматычная горная парода з групы габра-базальтаў. Складзены з плагіяклазаў і аўгіту з прымессю магнетыту, ільменіту, другасных мінералаў, радзей алівіну, кварцу. Колер цёмна-шэры ці зеленавата-чорны. Шчыльн. 2700—3300 кг/м^3. Трываласць на сціскванне да 300 МПа. Т-ра плаўлення 1005—1250 °С. Трапляецца ў магматычных формах складкавых абласцей і платформ. Формы залягання Д. — патокі, покрывы, дайкі, сілы і інш. Пашыраны ў пародах, якія складаюць крышт. фундамент Беларусі (г. Жыткавічы, р.п. Мікашэвічы, г. Шчучын). Выкарыстоўваецца як будматэрыял і сыравіна для каменнага ліцця, як напаўняльнік бетону, штучных камянёў і інш.

У.Я.Бардон.

ДЫЯБЕ́Т ЦУКРО́ВЫ, цукровая хвароба, эндакрыннае захворванне, абумоўленае поўным (інсулінзалежны Д.ц.) або адносным (інсуліннезалежны Д.ц.) недахопам у арганізме гармону *інсуліну* або яго нізкай біял. актыўнасцю. Характарызуецца парушэннем усіх відаў абмену рэчываў і пашкоджаннем буйных і дробных крывяносных сасудаў. Д.ц. — вынік недастатковага ўтварэння ў *падстраўнікавай залозе* інсуліну з прычыны функцыян. прыгнечанасці або арган. пашкоджання β-клетак астраўкоў Лангерганса ў выніку парушэння абмену рэчываў, інфекц. хвароб, выдзялення вял. колькасці гармонаў антаганістаў інсуліну, *атрафіі* і перараджэння парэнхімы падстраўнікавай залозы, хранічнага пераядання і інш. Пры недахопе інсуліну памяншаецца ўтварэнне глікагену з *глюкозы*, таму тканкі не засвойваюць цукар і не могуць выкарыстоўваць яго як крыніцу энергіі, што вядзе да павышэння ўзроўню цукру ў крыві (гіперглікемія) і выдзяленню яго з мачой (*гліказурыя*). У больш цяжкіх выпадках парушаецца функцыя печані: у ёй не сінтэзуецца і не назапашваецца глікаген, не абясшкоджваюцца прадукты распаду бялкоў і тлушчаў, што прыводзіць да *ацыдозу*, які можа выклікаць дыябетычную кетаацыдатычную *кому*. У хворых на Д.ц. адзначаюцца прамерны апетыт і смага, выдзяленне вял. колькасці мачы (да 8 л за суткі) з высокай удз. в., скурны сверб, запаленне слізістых абалонак поласці рота і інш. Лячэнне — дыета, інсулін і таблеткі, якія зніжаюць цукар.

Літ.: Балаболкин М.И. Сахарный диабет. М., 1994; Справочник по клинической эндокринологии. Мн., 1996.

Т.В.Мохарт.

ДЫЯГАНА́ЛЬ (лац. diagonalis ад грэч. diagōnios які ідзе ад вугла да вугла) у геаметрыі, адрэзак прамой, што злучае 2 вяршыні многавугольніка, якія не належаць адной старане, або 2 вяршыні мнагагранніка, якія не размешчаны на адной грані. Калі колькасць вяршынь многавугольніка роўная n, то колькасць дыяганалей роўная $n(n-3)/2$.



Да арт. **Дыяганаль** у геаметрыі. 1 — дыяганалі прамавугольніка AC, BD; 2 — дыяганаль паралелепіпеда B_1D.

ДЫЯГАНА́ЛЬ, шчыльная тканіна з баваўнянай ці шарсцяной кручанай пражы з рэзкімі косымі рубчыкамі на паверхні. З Д. шыюць вайск. абмундзіраванне, курткі, паліто і інш.

ДЫЯГЕНЕ́З (ад *дыя*... + ...*генез*), сукупнасць прыродных фізіка-хімічных пра-

цэсаў ператварэння рыхлых асадкаў на дне вадаёма і на сушы ў асадкавыя горныя пароды ва ўмовах верхняй зоны зямной кары. Вылучаюць Д. ранні (этап фізіка-хім. ўраўнаважання асадку) і позні (этап пераразмеркавання рэчыва з утварэннем розных мінер. сцяжэнняў). У выніку Д. змяншаецца колькасць глеевай вады, асадак робіцца больш шчыльным і цвёрдым. Ператварэнне асадкавай пароды да поўнай літафікацыі (акамяненне) адбываецца на стадыях *катагенезу* і *метагенезу*. *У.І.Шкуратаў.*

ДЫЯ́ГНАЗ (ад *дыя...* + грэч. gnōsis распазнаванне), медыцынскае заключэнне пра стан арганізма хворага, захворванне (траўму) ці прычыну смерці, выражанае ў тэрмінах, прынятых класіфікацыямі і пералікам хвароб. Д.— заключны этап *дыягностыкі*. Ён дапамагае выбраць аптымальныя метады лячэння і прафілактыкі. Адрозніваюць 4 віды Д. Клінічны Д. адлюстроўвае асаблівасці захворвання канкрэтнага хворага і назву пэўнай хваробы. Для яго ўстанаўлення вызначаюць прыроду і механізм развіцця хваробы, ускладненні і хваробы, якія развіваюцца адначасова, характар і ступень парушэння функцый сістэм. Бывае папярэдні і заключны. Патолагаанатамічны Д. устанаўлівае ўрач-патолагаанатам пасля смерці хворага на аснове марфал. змен. Эпідэміялагічны Д. — заключэнне аб прычынах і асаблівасцях узнікнення, развіцці, цячэнні і зніжэнні эпідэміял. ачага. На яго аснове складаецца план супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. Судова-медыцынскі Д. — спец. заключэнне аб сутнасці пашкоджання (хваробы), стане хворага ці прычыне смерці, складзенае на аснове суд.-мед. экспертызы. *М.Ф.Сарока.*

ДЫЯГНАСТЫ́ЧНЫ ЦЭНТР, медыцынская ўстанова, якая ажыццяўляе абследаванне насельніцтва на аснове канцэнтрацыі і выкарыстання найноўшых сродкаў і метадаў дыягностыкі. Забяспечвае неабходны аб'ём і ўзровень дыягностыкі, комплексную кансультацыю спецыялістаў любога профілю. Структура Д.ц.: кансультацыйнае аддзяленне і 6 дыягнастычных — лабараторна-дыягнастычнае (праводзяцца біяхім., імуналагічныя, мікрабіял. і інш. даследаванні), эндаскапічнае (вызначаецца стан унутр. полых органаў — страўніка, жоўцевага пузыра, бронхаў і інш.), функцыян. дыягностыкі (даследаванні сэрца і сасудаў), ультра-гукавых даследаванняў унутр. органаў, прамянёвай дыягностыкі з камп'ютэрнай тамаграфіяй, клінічнай патамарфалогіі. На Беларусі першы Д.ц. адкрыты ў 1989 у Мінску. *А.В.Таўкачоў.*

ДЫЯГНАСТЫ́ЧНЫЯ МЕ́ТАДЫ, метады, што выкарыстоўваюцца для вызначэння, удакладнення і распазнавання хваробы. Падзяляюцца на асн. і дадатковыя, ці спецыяльныя. Асн. Д.м. — *анамнез*, агляд хворага, *пальпацыя*, *перкусія*, *аўскультацыя*. Спец. метады ўключаюць этыялагічны, марфал., патагенет. і функцыян. кампаненты, якія характарызуюць асаблівасці ўзнікнення і цячэння хваробы, даследаванні на субклетачным узроўні і апрацоўку на ЭВМ. Класіфікуюцца на Д.м. прамянёвыя (рэнтгеназкапія і рэнтгенаграфія, рэнтгенаўская камп'ютэрная і магнітнарэзанансная тамаграфіі, ультрагукавая тэрмаграфія), электрафізіял. (электракардыяграфія, электраэнцэфалаграфія і інш.), радыенуклідныя (радыяграфія, сцынтыграфія і інш.), лабараторныя (гісталагічныя, цыталагічныя, біяхім., імуналагічныя), мікрабіял., біяфіз. (спектрафотаметрыя, флюарыметрыя, паляраграфія і інш.), эндаскапічныя (фібрагастрадуадэназкапія, рэктаскапія, сігмаскапія, каланаскапія і інш.), нагрузачныя метады ці функцыян. тэсты (эргаметрычныя, ізаметрычныя, псіхафізіял. стрэс-сістэмы, фармакалагічныя пробы і інш.). *А.В.Таўкачоў.*

ДЫЯГНО́СТЫКА (ад грэч. diagnōstikos здольны распазнаваць), раздзел клінічнай медыцыны, які вывучае метады і прынцыпы распазнавання хваробы, пастаноўкі *дыягназу*, назначэння лячэння і правядзення прафілактычных мерапрыемстваў. Уключае 3 асн. раздзелы: семіётыку (вывучае сімптомы хваробы), метады дыягнастычнага абследавання хворага (дыягнастычную тэхніку), метадалагічныя асновы, якія вызначаюць тэорыю і метады дыягназу. Пры Д. нараўне з *анамнезам*, мед. аглядам *аўскультацыяй*, *пальпацыяй*, *перкусіяй* выкарыстоўваюць удасканаленыя тэхн. сродкі і метады — *ангіяграфію*, камп'ютэрную тамаграфію, *рэнтгенаграфію*, *фонакардыяграфію*, *электракардыяграфію*, *электраэнцэфалаграфію*, *эндаскапію*, радыеізатопную і ультрагукавую Д. і інш. З дапамогай эндаскапічных, рэнтгеналагічных, ультрагукавых метадаў даследавання, лапараскапіі праводзяць Д. захворванняў гінекалагічнага профілю. Ультрагук выкарыстоўваюць у акушэрстве для прэнатальнай Д. (дае магчымасць удакладніць стан плода, плацэнты, правесці Д. заган развіцця плода). Д. неабходная пры даследаванні нервовай, сардэчна-сасудзістай, дыхальнай, касцявой, мочавыдзяляльнай сістэм, органаў стрававання. Найб. важная ранняя Д. захворванняў, зыход якіх залежыць ад своечасовасці лячэння (напр., раку, туберкулёзу). Адным са шляхоў ранняй Д. з'яўляецца дыспансернае абследаванне практычна здаровых людзей. Гл. таксама *Дыспансерызацыя*.

ДЫЯГНО́СТЫКА ПЛА́ЗМЫ, сукупнасць метадаў вызначэння параметраў (характарыстык) *плазмы*; раздзел фізікі плазмы, які вывучае фіз. асновы гэтых метадаў і распрацоўвае іх. Да параметраў плазмы адносяцца шчыльнасць часціц, т-ра (сярэдняя энергія часціц), інтэнсіўнасць выпрамянення, характарыстыкі эл. і магн. палёў і інш. Вынікі Д.п. выкарыстоўваюцца пры правядзенні эксперым. даследаванняў, а таксама для кантролю за станам плазмы і кіравання працэсамі ў плазменных установах.

Д.п. бярэ пачатак у астрафіз. даследаваннях. Лабараторная Д.п. сфарміравалася як самаст. дысцыпліна ў працах па вывучэнні газавых разрадаў (гл. *Электрычныя разрады ў газах*). Большасць метадаў Д.п. бескантактныя: носьбіты інфармацыі — палі і выпрамяненні ў наваколлі плазмы, для характарыстык якіх папярэдне ўстаноўлена залежнасць ад параметраў плазмы. Пасіўныя метады заснаваны на рэгістрацыі выпрамяненняў і патокаў часціц з плазмы або вымярэнні характарыстык навакольных палёў; актыўныя — на вымярэнні знешняга выпрамянення, якое праходзіць праз плазму, а таксама водгуку плазмы на яго. Найб. пашыраны: зондавы, аптычны (у т.л. фатагр., ценявы, інтэферометрычны, галаграфічны і інш.), спектраскапічны, мікрахвалевы, рэнтгенаўскі, лазерны, карпускулярны і цеплафіз. метады.

На Беларусі даследаванні па Д.п. праводзяцца з 1960-х г. у Ін-тах фізікі, цепла- і масаабмену Нац. АН, НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ.

1

2

Дыягнастычны цэнтр у Мінску. 1. Ультрагукавое даследаванне сэрца. 2. Камп'ютэрнае даследаванне галаўнога мозга.

Літ.: Диагностика плазмы. [Вып. 1—7]. М., 1963—90; Кузнецов Э.И., Щеглов Д.А. Методы диагностики высокотемпературной плазмы. 2 изд. М., 1980.

Я.А.Яршоў.

ДЫЯГРА́МА (ад *дыя...* + *...грама*), графічнае адлюстраванне суадносін паміж рознымі велічынямі; у статыстыцы — чарцёж, на якім у маштабе адлюстраваны даныя ў выглядзе ліній ці геам. фігур. Бываюць лінейныя, стужачныя, слупковыя, сектарныя, аб'ёмныя і інш. Напр., Д. накіраванасці антэны паказвае залежнасць напружанасці поля выпрамянення ад напрамку; фазавая Д.— залежнасць устойлівага фазавага стану рэчыва ад тэрмадынамічных параметраў, якія яго вызначаюць (гл. *Дыяграма стану*); у вытв-сці з дапамогай Д. рашаюцца задачы мадэлявання працэсаў кіравання, выяўляюцца і рацыяналізуюцца ўзаемасувязі паміж рознымі фактарамі, выяўляюцца разліковыя паказчыкі і нарматывы, выконваюцца кантроль, улік і інш. Гл. таксама *Гістаграма*, *Графік*, *Намаграма*.

ДЫЯГРА́МА СТА́НУ, дыяграма раўнавагі, фазавая дыяграма, графічнае адлюстраванне залежнасці паміж параметрамі стану фіз.-хім. сістэмы (т-ра, ціск) ці паміж імі і некаторымі інш. яе параметрамі (саставам, структурай, канцэнтрацыяй). Звычайна Д.с. паказвае сувязь паміж т-рай, ціскам і саставам сістэмы, калі ў ёй больш чым адзін кампанент. Д.с. аднакампанентнай сістэмы паказвае сувязь паміж ціскам і т-рай.

Д.с. розных сістэм будуюцца на аснове эксперымента метадамі *фізіка-хімічнага аналізу*. На Д.с. вады на гарыз. восі адкладваюцца т-ры (у градусах Кельвіна), на вертыкальнай — ціск (у паскалях). У т.зв. трайным пункце (т-ра 273,16 К і ціск 611 Па) сістэма складаецца з лёду, вады і пары, якія знаходзяцца ў раўнавазе. Лініі дыяграмы адлюстроўваюць стан раўнавагі: 1 — лёду з парай, 2 — лёду з вадой, 3 — вады з парай. У т.зв. палях паміж лініямі сістэма складаецца з рэчыва H_2O толькі ў адным агрэгатным стане (лёд, вада, пара). З дапамогай Д.с. вызначаюць т-ру плаўлення сплаваў, выбіраюць т-ру гарачай апрацоўкі ціскам, устанаўліваюць рэжымы тэрмічнай апрацоўкі сплаваў, ствараюць сплавы з загадзя зададзенымі ўласцівасцямі і інш.



Дыяграма стану аднакампанентнай сістэмы (вады): 1, 2, 3 — крывыя ўзгонкі (сублімацыі), плаўлення і кіпення (выпарэння); 0 — трайны пункт; К — крытычны пункт.

Літ.: Захаров А.М. Диаграммы состояния двойных и тройных систем. 3 изд. М., 1990; Глазов В.М., Лазарев В.Б., Жаров В.В. Фазовые диаграммы простых веществ. М., 1980; Петров Д.А. Двойные и тройные системы. М., 1986.

ДЫЯДО́Р СІЦЫЛІ́ЙСКІ (грэч. Diodōros Sikeliōtēs; каля 90, Агірыён, в-аў Сіцылія — 21 да н.э.), старажытнагрэчаскі гісторык. Аўтар працы «Гістарычная бібліятэка» (40 кн.; захаваліся 1—5 і 11—20, астатнія — у фрагментах), дзе сінхронна выкладаюцца падзеі з гісторыі стараж. Грэцыі, эліністычных дзяржаў, Рыма і Усходу з легендарных часоў да сярэдзіны 1 ст. да н.э.

Літ.: Строгецкий В.М. Возникновение и развитие исторической мысли в Древней Греции: (На материале изучения «Исторической библиотеки» Диодора Сицилийского). Горький, 1985.

ДЫЯДО́ХІ (ад грэч. diadochos пераемнік, нашчадак), палкаводцы *Аляксандра Македонскага* (Пердыка, Антыпатр, Антыгон I Аднавокі, Яўмен, Касандр, Пталамей, Лісімах, Селеўк I, Нікатар і інш.), якія пасля смерці Аляксандра (323 да н.э.) падзялілі паміж сабой яго імперыю. У выніку працяглай барацьбы паміж імі (т. зв. войны дыядохаў), а таксама паміж іх нашчадкамі (т. зв. эпігонамі) узніклі 3 буйныя дзяржавы: Егіпет (пад уладай *Пталамеяў*), Македонія (на чале з Антаганідамі), дзяржава *Селеўкідаў*. Гл. таксама *Эліпізм*.

ДЫЯДЭ́МА (грэч. diadēma), 1) галаўная павязка стараж.-грэч. жрацоў. 2) Галаўны ўбор (лобная павязка з тканіны або металічны, расшыраны ў сярэдняй ч., абруч з аздобай) — сімвал улады ў старажытнасці і сярэдневякоўі. У Еўропе вядома з эпохі *неаліту*. На Беларусі знойдзены 2 Д. *сярэднедняпроўскай культуры* на могільніку Рудня-Шлягіна Веткаўскага р-на Гомельскай вобл. (пляскатыя медныя пласціны, сагнутыя ў выглядзе абруча з завужанымі разамкнёнымі канцамі).

Медная **дыядэма** 22—14 ст. да н.э. з могільніка Рудня-Шлягіна Веткаўскага р-на.

ДЫЯЗАКАПІ́РАВАННЕ, узнаўленне пазітыўных (ці негатыўных) копій графічных і тэкставых арыгіналаў на аснове *дыязатыпіі*. Выкарыстоўваецца для размнажэння тэхн. дакументацыі, чарцяжоў, графікаў і інш. з любым фарматам арыгіналаў.

Пры Д. святлакопіі вырабляюць на спец. святлоадчувальных паперах, якія маюць высокую раздзяляльную здольнасць і кантрастнасць; колер копіі (напр., чырвоны, чорны, блакітны) залежыць ад складу *дыязазлучэння*, якім пакрыта папера. Пры экспанаванні ўтвараецца скрыты відарыс: дыязазлучэнні разбураюцца пад дзеяннем святла. Для атрымання святлакопіі паперу праяўляюць ў пары аміяку ці шчолачным растворы.

Дыяклетыян.

ДЫЯЗАТЫ́ПІЯ, атрыманне відарысаў з дапамогай святлоадчувальных матэрыялаў на аснове *дыязазлучэнняў*. Выкарыстоўваецца для размнажэння чарцяжоў. Гл. таксама *Дыязакапіраванне*.

ДЫЯ́КАН (ад грэч. diakonos служка), ніжэйшы духоўны чын у правасл. царкве. Дапамагае епіскапам і святарам у час богаслужэння і адпраўлення царк. таінстваў, але сам іх не спраўляе. Адрозніваюць старэйшых Д. — *протадыяканаў*, Д.-манахаў — іерадыяканаў, архідыяканаў (знаходзяцца пры епіскапах і архірэях).

ДЫЯКЛЕТЫ́ЯН Гай Аўрэлій Валерый (Gaius Aurelius Valerius Diocletianus; каля 240, Дыяклея, каля сучаснага г. Шкодэр, Албанія — 3.12.316), старажытнарымскі імператар [284—305].

Прафес. ваенны. Абвешчаны імператарам пасля смерці правіцеля Нумерыяна. Ліквідаваў паўстанне *багаўдаў* у Галіі (285—286), маўрытанскіх плямён у Афрыцы (290—295) і інш. З мэтай паляпшэння кіруемасці Рым. імперыяй падзяліў яе на 4 часткі (тэтрархіі; складаліся з 12 *дыяцэзаў*), прызначыў 3 супраўвіцеляў (293), аддзяліў ваен. ўладу ад цывільнай, павялічыў армію, устанавіў фіксаваныя цэны і памер заработнай платы, увёў новую сістэму падаткаабкладання. У 303—304 праследаваў хрысціян. У 305 добраахвотна адмовіўся ад улады, жыў у сваім маёнтку ў Салоне (сучасны г. Спліт, Харватыя), дзе і памёр. Гл. таксама *Дамінат*.

Літ.: Федорова Е.В. Люди императорского Рима. М., 1990. С. 243—248.

ДЫЯКРЫТЫ́ЧНЫЯ ЗНА́КІ, дыякрытыкі, дадатковыя знакі ў алфавіце, для больш дакладнай перадачы гукавой сістэмы мовы. Ужываюцца над і

пад літарамі, радзей — побач. Надаюць літарам новае значэнне (польск. ż, ć, ś; чэш. ž, č, š), абазначаюць варыянты гукаў (франц. è, é, ê; польск. ą, ę, ó), паказваюць, што літару трэба чытаць ізалявана (франц. ï) і інш. Прасадычныя Д.з. паказваюць на працягласць ці кароткасць гука, *націск* і яго тыпы, тоны (напр., у в'етнамскай мове). Д.з. выкарыстоўваюцца ў большасці алфавітаў на лац., кірыліцкай, араб. і інд. графічных асновах, у некаторых сістэмах транскрыпцыі і праектах міжнар. алфавіта. У слав. графіцы з'явіліся пад уплывам стараж.-грэч. пісьма. Самыя характэрныя Д.з. старабел. пісьменства — камора (⌒), паерык (ˢ), цітла (⌒⌒). У сучасным бел. алфавіце з Д.з. ўжываюцца літары «ё», «й», «ў», адмысловае графічнае значэнне мае апостраф (').

А.М.Булыка.

ДЫЯ́ЛА, рака ў Іране і Іраку, левы прыток р. Тыгр. Даўж. (ад вытоку р. Сірван) 440 км, пл. бас. больш за 30 тыс. км^2. Пачынаецца ў гарах Загрос, цячэ па Месапатамскай нізіне, утварае вял. дэльту. Сярэдні гадавы расход вады 130 м^3/с. Веснавое разводдзе, летняя межань. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная ў час разводдзя да г. Баакуба (Ірак).

ДЫЯЛЕ́КТ (ад грэч. dialektos гаворка), найбольш буйное этна-генетычнае адзінства *гаворак* або іх груп у складзе мовы, блізкіх асн. асаблівасцямі сваёй будовы (фанет. сістэмай, граматычным ладам, слоўнікам) і сумежных па тэрытарыяльным размяшчэнні. Бел. дыялектная мова складаецца з паўн.-ўсх. Д. (аб'ядноўвае роднасныя па сваёй зыходнай аснове гаворкі мясц. насельніцтва паўн.-ўсх. ч. краіны) і паўд.-зах. Д. (гаворкі паўд.-зах. ч. краіны, за выключэннем яе паўд.-зах. кутка). Паводле мясц. асаблівасцей гаворкі паўн.-ўсх. Д. падзяляюцца на 3 групы — віцебскую, усх.-магілёўскую і полацка-мінскую, паўд.-зах. Д. — гродзенска-навагрудскую, слуцкую і мазырскую (усх.-палескую). Паміж паўн.-ўсх. і паўд.-зах. дыялектамі вылучаецца група сярэднебеларускіх (пераходных) гаворак, якія склаліся ў працэсе ўзаеманакладання і «размывання» берагоў супрацьлеглых Д. на іх стыку (у выніку змешвання іх «прыбярэжных» гаворак і ўзаемаўплыву). Паўн.-ўсх. і паўд.-зах. Д. разам з групай сярэднебел. гаворак складаюць асноўны масіў гаворак бел. нац. мовы, які тэрытарыяльна супрацьпастаўляецца па сваіх асаблівасцях зах.-палескай групе гаворак. Апошняя з'яўляецца часткай Д. бел.-ўкр. моўнага сумежжа. Асаблівасці Д. найб. адлюстроўваюцца ў мове сельскага насельніцтва. Аднак у сувязі з яго інтэнсіўным пераразмеркаваннем разбураюцца тэр. аднароднасць груп гаворак і дыялектныя межы. На аснове пэўных дыялектных і занальных аб'яднанняў сфарміравалася і знаходзіцца ў цеснай сувязі з імі і зараз бел. *літаратурная мова*.

Літ.: Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак. Мн., 1968—69.

А.А.Крывіцкі.



Аўтар А.А.Крывіцкі

ДЫЯЛЕКТАЛАГІ́ЧНЫ А́ТЛАС, лінгвістычны атлас, сістэматызаваны зборнік дыялекталагічных карт пэўнай тэрыторыі, якія паказваюць пашырэнне асобных дыялектных асаблівасцей адной мовы ці комплексу моў. Падзяляюцца на некалькі тыпаў. Д.а. адной мовы, або нацыянальныя: «Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі» П.А.Бузука (1928), *«Дыялекталагічны атлас беларускай мовы»*, «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» у 5 тамах (т. 1—4, 1993—97). Д.а. рэгіянальныя, якія ахопліваюць частку тэрыторыі, адной або некалькіх моў: «Атлас усходнеславянскіх гаворак Беласточчыны» (т. 1—5, 1980—95; выд. працягваецца), «Параўнальнае вывучэнне геаграфіі слоў (Палессе—Мазоўша)» І.Тарнацкага (1939), «Лінгвістычны атлас Ніжняй Прыпяці» Т.В.Назаравай (1985) і інш. Д.а. групы роднасных моў: Агульнаславянскі лінгвістычны атлас (АЛА; выходзіць у серыях — лексікасловаўтваральнай і фанетыка-граматычнай; вып. 1—2, 1988—90; выд. працягваецца). Д.а. тэрыторый, на якіх бытуюць гаворкі як роднасных, так і рознасістэмных моў: Лінгвістычны атлас Еўропы (ЛАЕ, вып. 1—6, 1983—97; выд. працягваецца). *Ф.Д.Клімчук.*

«ДЫЯЛЕКТАЛАГІ́ЧНЫ А́ТЛАС БЕЛАРУ́СКАЙ МО́ВЫ», сістэматызаваны набор лінгвістычных карт, на якіх пры дапамозе ўмоўных знакаў адлюстравана пашырэнне ў межах *беларускай мовы* разнастайных асаблівасцей яе *гаворак*. Выдадзены ў 1963. Адзін з найб. поўных лінгвістычных атласаў, адлюстроўвае стан развіцця бел. гаворак у іх прасторавых узаемаадносінах у сярэдзіне 20 ст. Стварыўся на аснове метадалагічных прынцыпаў і метадычных прыёмаў, прынятых сав. школай *лінгвістычнай геаграфіі*. Яго складанню папярэднічаў працяглы перыяд абследавання жывых гаворак у межах нац. тэр. Беларусі па спец. праграме, арыентаванай на выяўленне сістэмна звязаных дыялектных адрозненняў. У аснове Атласа — тэорыя акад. Р.І.*Аванесава*. Складаецца з 2 раздзелаў. У 1-м змешчаны 7 гіст.-адм. і 338 лінгвістычных карт, якія даюць максімальную інфармацыю пра фанет. сістэму, грамат. структуру і лексічныя асаблівасці бел. гаворак. 2-і раздзел уключае ўступныя артыкулы, каментарыі да карт, даведачны і фактычны матэрыял. Калектыву аўтараў (Г.У.Арашонкава, М.В.Бірыла, Н.Т.Вайтовіч, І.М.Гайдукевіч, А.П.Груца, З.Ф.Краўчанка, А.А.Крывіцкі, Ю.Ф.Мацкевіч, А.Р.Мурашка, Я.М.Рамановіч, А.І.Чабярук, В.М.Шэлег) і рэдактараў (Аванесаў, К.Крапіва, Мацкевіч) за комплекс работ прысуджана Дзярж. прэмія СССР 1971. *Ю.Ф.Мацкевіч.*

ДЫЯЛЕКТАЛО́ГІЯ (ад *дыялект* + *...логія*), раздзел мовазнаўства, які вывучае *дыялекты*. Бел. Д. вылучылася з фальклярыстыкі і этнаграфіі ў канцы 19 ст.

Фактычныя звесткі пра жывую вусную мову беларусаў пачалі назапашвацца ў фальклэтнагр. запісах 1-й пал. 19 ст. Такая спадарожная рэгістрацыя бел. дыялектнай мовы была асноўнай да пач. 20 ст. (З.Я.Даленга-Хадакоўскі, І.І.Шыдлоўскі, М.А.Дзмітрыеў, Я.Чачот, П.М.Шпілеўскі, А.Кіркор, Р.С.Зянькевіч, П.В.Шэйн, П.А.Бяссонаў, М.Я.Нікіфароўскі, Е.Р.Раманаў, М.А.Янчук, М.В.Доўнар-Запольскі, А.Я.Багдановіч, М.Федароўскі і інш.). Спробы лінгвістычнага даследавання сабраных матэрыялаў адносяцца да 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. (І.І.Насовіч, М.А.Коласаў, К.Ю.Апель, І.А.Нядзёшаў, Раманаў, У.М.Дабравольскі, А.К.Сержпутоўскі, І.А.Сербаў). Заснавальнікам бел. Д. стаў Я.Ф.*Карскі*. Пытанні бел. Д. асвятляліся таксама ў працах па рускай (усх. слав.) гісторыі і Д. (А.І.Сабалеўскі, А.А.Шахматаў, В.А.Багародзіцкі). Важнае значэнне мелі працы Маск. дыялекталагічнай камісіі (М.М.Дурнаво, М.М.Сакалоў, Дз.М.Ушакоў).

У сав. час працягвалася вывучэнне гаворак паасобных раёнаў Беларусі, у т.л. бел.-ўкр. і бел.-рус. моўных сумежжаў (П.А.Бузук, П.А.Растаргуеў), бел. міждыялектнай зоны пераходных гаворак (І.В.Воўк-Левановіч, С.М.Некрашэвіч). Выконвалася шырокая праграма збірання дыялектнай лексікі, распрацаваная камісіяй Інбелкульта па складанні слоўніка жывой бел. мовы. Выйшлі (з 16 запланаваных) «краёвыя» слоўнікі Віцебшчыны (М.І.Каспяровіч), Чэрвеншчыны (М.В.Шатэрнік), Калінінскай акр. і ўсх. Магілёўшчыны (І.К.Бялькевіч), зах. Браншчыны (Растаргуеў). Узнікла новая галіна Д. — *лінгвістычная геаграфія*, «Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі» Бузука (1928) — першы нац. атлас у слав. Д. У паслявае. часы дэталёва абследавана мова паасобных раёнаў і абласцей Беларусі і прааналізаваны шэраг катэгорый і з'яў дыялектнай мовы — назоўнік, прыметнік, займеннік, дзеяслоў, словаўтварэнне, сінтаксіс, гукі, аканне (М.В.Бірыла, Ю.Ф.Мацкевіч, Н.Т.Вайтовіч і інш.). У галіне лексікалогіі і лексікаграфіі праводзіцца збіранне матэрыялаў, якія друкуюцца ў выглядзе *дыялектных слоўнікаў*, дыялектных лексікаграфічных зборнікаў («Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча», т. 1—5, 1979—86; «Тураўскі слоўнік», т. 1—5, 1982—87, «Дыялектны слоўнік», вып. 1—3, 1959—70, Ф.М.Янкоўскага, асобныя зборы лексікі і фразеалогіі Мсціслаўшчыны Г.Ф.Юрчанкі і інш.). Створаны комплекс фундаментальных лінгвагеаграфічных прац: *«Дыялекталагічны атлас беларускай мовы»*, «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968—69), «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» (т. 1—4, 1993—97, выд. працягваецца) і інш. З 1970-х г. даследуюцца тэматычныя групы дыялектных слоў, лексіка старых рамёстваў, лексічныя сувязі бел. гаворак з інш. мовамі і іх дыялектамі. Новы кірунак бел. Д. — вывучэнне сучаснага мясц. маўлення і моўнай сітуацыі ў сельскіх рэгіёнах і гарадах рэспублікі.

Літ.: Нарысы па беларускай дыялекталогіі. Мн., 1964; Блінава Э.Д., Мяцельская Е.С. Беларуская дыялекталогія. 2 выд. Мн., 1980. *А.А.Крывіцкі*

ДЫЯЛЕ́КТНЫ СЛО́ЎНІК, абласны слоўнік, жанр рознатыповых лінгвістычных даведнікаў, у якіх падаецца мясц. лексіка абмежаванага тэрытарыяльнага пашырэння. Паводле прынцыпаў адбору рэестравай лексікі Д.с. падзяляюцца на: поўныя (сістэмныя), якія апісваюць усю без выключэння лексіку пэўнай гаворкі; дыферэнцыяльныя (гл. ў арт. *Дыферэнцыяльны слоўнік*); зводныя (агульныя), што змяшчаюць дыялектную лексіку розных рэгіёнаў ці розных гаворак пэўнай нац. мовы (напр., «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча», т. 1—5, 1979—86; «Беларускае дыялектнае слова» Л.Ф.Шаталавай, 1975, і інш.; своеасаблівая разнавіднасць зводнага Д.с. — *дыялекталагічны атлас*); рэгіянальныя (абласныя, краёвыя), што падаюць мясцовыя словы пэўнай гаворкі, групы гаворак ці пэўнага рэгіёна, якімі гэтыя гаворкі адрозніваюцца ад інш. бел. гаворак [напр., «Віцебскі краёвы слоўнік» М.І.Каспяровіча, 1927, «Краёвы слоўнік Лагойшчыны» А.Варлыгі, 1970, «Тураўскі слоўнік», т. 1—5, 1982—87, і інш.]. Паводле характару рэестравых адзінак адрозніваюць Д.с.: мясцовай лексікі (большасць бел. Д.с.); народна-дыялектнай фразеалогіі («Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі», Е.С.Мяцельскай і Я.М.Камароўскага, 1972; гл. таксама ў арт. *Фразеалагічны слоўнік*); пареміялагічныя («Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі» Ф.М.Янкоўскага, 1957, «Паслухай, што людзі кажуць» В.І.Рабкевіча, 1985, і інш.); анамастычныя (напр., «Мікратапанімічныя назвы» Я.М.Адамовіча, 1971); словаўтваральныя (напр., «Народная лексіка і словаўтварэнне» П.У.Сцяцко, 1972, «Народнае вытворнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны» Г.Ф.Юрчанкі, вып. 1—3, 1981—85). У залежнасці ад прынцыпаў семантызацыі выкарыстаных рэестравых слоў вылучаюцца Д.с.: тлумачальныя (боль-

шасць бел. Д.с.), перакладныя (напр., «Слоўнік беларускай мовы» І.І.Насовіча, факс. выд., 1983), сінанімічныя (напр., «Народная сінаніміка» Юрчанкі, 1969), тэматычныя (напр., «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак», т. 1. Раслінны і жывёльны свет, 1993). Большасць бел. Д.с. складаліся на матэрыяле палявых запісаў дыялектных слоў, але існуюць і такія, лексіка якіх адбіралася з літ. крыніц: «Дыялектызмы ў творах беларускіх савецкіх пісьменнікаў: Кароткі слоўнік-даведнік» М.В.Абабуркі (1979), і інш.

Літ.: Крывіцкі А.А. Сучасная беларуская дыялектная лексікаграфія: Стан і перспектывы // Македонски јазик. 1980. Т. 31.

Ў.К.Шчэрбін.

ДЫЯЛЕКТЫ́ЗМ, слова ці выраз з мясц. гаворак, якія выкарыстоўваюцца ў літ. мове як адзін са сродкаў стылістычнай выразнасці. Асн. сфера іх ужывання — гутарковая мова і мова маст. л-ры. Вылучаюць Д.: лексічныя (уласналексічныя і этнаграфічныя), якія служаць мясц. назвай агульнавядомых або мясц. прадметаў і з'яў; семантычныя (адрозніваюцца мясц. значэннем); фразеалагічныя (мясц. выразы ўстойлівага характару); фанетычныя (адлюстроўваюць гукавыя асаблівасці мясц. гаворак); словаўтваральныя (вызначаюцца словаўтваральнымі сродкамі мясц. гаворак); граматычныя (маюць мясц. марфалагічную або сінтаксічную структуру). Найб. апраўданыя Д. ў мове персанажаў твора, аднак ад размернага ўжывання Д. мова маст. твора засмечваецца, становіцца малазразумелай, стылістычна невыразнай.

Літ.: Абабурка М.В. Стылістычна абмежаваныя словы ў мове беларускай мастацкай літаратуры. Мн., 1981.

Л.І.Бурак.

ДЫЯЛЕ́КТЫКА [ад грэч. dialektikē (technē) майстэрства весці гутарку, спрэчку], вучэнне аб найб. агульных законах развіцця космасу і прыроды, грамадства, чалавека і мыслення. Асн. прынцыпы Д. — усебаковая, усеагульная сувязь рэчаў і з'яў, станаўленне і развіццё. У склад Д. як вучэння ўваходзяць філас. тэорыя, метад і метадалогія філас. пазнання. Першыя спробы дыялект. асэнсавання прыроднай і грамадскай рэчаіснасці, быцця чалавека ў свеце зроблены ў глыбокай старажытнасці і знайшлі сваё ўвасабленне ў духоўнай культуры і светапоглядзе ўсх. цывілізацый: егіпецкай, шумерскай, індыйскай, кітайскай і інш. Унікальны ўклад у развіццё дыялект. мыслення зрабіла ант. грэч. цывілізацыя, якая стварыла спрыяльныя ўмовы для росквіту духоўнай творчай дзейнасці чалавека, асабліва ў галіне філасофіі, эстэтыкі, навукі. Паняцце Д. ўпершыню выкарыстаў *Сакрат*, разумеючы пад ім майстэрства весці мэтанакіраваны дыялог, калі супрацьпастаўленне і барацьба розных думак спрыяюць знаходжанню ісціны. Сакратаўскае разуменне Д. развіў *Платон* у шэрагу сваіх прац, напісаных у форме дыялога. Ён даў дыялект. інтэрпрэтацыю філас. катэгорый руху, спакою, адрознення, тоеснасці, быцця, падкрэсліваючы іх супярэчлівы змест. Характэрнай рысай дыялект. мыслення старажытнагрэч. філасафаў было ўспрыманне свету ў якасці адзінага непадзельнага цэлага, якое знаходзіцца ў стане стыхійнага руху і змянення. У межах стыхійна-наіўнага ўяўлення аб непадзельнай рэчаіснасці ў Грэцыі існавалі і развіваліся формы суб'ектыўнай і аб'ектыўнай Д. *Геракліт* лічыў, што ўсё існуе і ў той жа час не існуе, таму што ўсё цячэ і змяняецца, узнікае і знікае, а свет з'яўляецца месцам няспыннай барацьбы процілеглых з'яў. У гэтай барацьбе процілегласцей ён бачыў галоўную прычыну развіцця. Стыхійнадыялект. ідэі знайшлі адлюстраванне ў вучэнні *Дэмакрыта*, *Леўкіпа*, *Эпікура* і інш. аб атамах і атамнай будове рэчаў. Істотнае даследаванне розных форм дыялект. мыслення правёў *Арыстоцель*. У часы панавання монатэістычных рэлігій, у прыватнасці хрысціянства, Д. фактычна атаясамлівалася з асобасным абсалютам — творцам космасу і прыроды і адначасова з першапрычынай іх няспыннага руху і змянення. У філасофіі новага часу дыялект. ідэі выкарыстоўваліся супраць панавання метафіз. поглядаў. Р.*Дэкарт* спрыяў пранікненню дыялект. спосабу мыслення ў матэматыку, абгрунтоўваў ідэю аб неаднароднасці прасторы і пачатак развіцця адносна да касмалогіі. Д.*Дзідро* лічыў рух унутр. уласцівасцю матэрыі і адстойваў эвалюц. погляды на жывую прыроду. Г.*Лейбніц* падышоў да дыялект. погляду на адзінства прасторы і часу. Навукова плённыя дыялект. думкі аб захаванні матэрыі і руху, эвалюц. паходжанні і развіцці зямлі выказаў М.В.*Ламаносаў*. У якасці універсальнай тэорыі і метаду пазнання свету шляхам знаходжання, аналізу і раскрыцця ўласцівых яму супярэчнасцей Д. распрацоўваўлася ў нямецкай класічнай філасофіі 18—19 ст. І.*Кант* вучыў, што працэс пазнання рэчаіснасці чалавекам абапіраецца на практычны вопыт, таму абстрактныя катэгорыі «бог», «душа», «свабода» і інш. не могуць прэтэндаваць на абсалютныя веды, а чалавечы розум у сваім імкненні авалодаць абсалютным няўхільна трапляе ў палон невырашальных супярэчнасцей. Выключнае месца ў станаўленні навук. канцэпцыі Д. займае філас. вучэнне Г.Гегеля, які абагульніў гіст. вопыт навук. дыялект. мыслення аб космасе, прыродзе і чалавеку, а ўвесь матэрыяльны і нематэрыяльны свет прадставіў у якасці працэсу бесперапынных змен і развіцця. Адначасова ён зрабіў спробу сфармуляваць унутр. законы Д. Змены, пераход рэчаў і з'яў з аднаго якаснага стану ў другі Гегель тлумачыў узаемадзеяннем супярэчнасцей і іх канчатковым вырашэннем, г.зн., што працэс развіцця адбываўся дзякуючы ўласным унутр. імпульсам, а развіццё з'яўлялася самаразвіццём. Такую ўласцівасць ён лічыў істотнай рысай абсалютнай ідэі, абсалютнага духу, што было абумоўлена сутнасцю ўсёй гегелеўскай філасофіі, паводле якой свядомасць з'яўляецца творцам рэчаіснасці. Дыялект. ідэі, погляды і канцэпцыі прадстаўнікоў ням. класічнай філасофіі далі штуршок развіццю матэрыялісц. Д., якую распрацоўвалі К.Маркс, Ф.Энгельс, У.І.Ленін. Яе асн. *катэгорыі* і законы: *прастора, час, рух, матэрыя, адзінства і барацьба процілегласцей, адмаўленне адмаўлення, пераход колькасных змен у якасныя* і інш. Матэрыялісц. Д. прыроды абгрунтоўвае і даказвае свае палажэнні, спасылаючыся на гіст. вопыт развіцця прыродазнаўчых навук, а Д. сац. жыцця звяртаецца да вывучэння асаблівых рыс чалавечага грамадства, суадносін суб'ектыўнага і аб'ектыўнага ў гісторыі, сац. прагрэсу, узаемаадносін грамадства і прыроды, грамадства і асобы і інш. Яна ўключае таксама тэарэт. праблемы пазнання, якое заснавана на прынцыпе *адлюстравання* і *дыялектычную логіку*.

Літ.: Гегель Г.В.Ф. Наука логики: Пер. с нем. Т. 1—3. М., 1970—72; Ленін У.І. Філасофскія сшыткі // Тв. Т. 38 (Полн. собр. соч. Т. 29); Современные зарубежные концепции диалектики: Критич. очерки. М., 1987; Ильенков Э.В. Философия и культура. М., 1991.

В.І.Боўш.

ДЫЯЛЕКТЫ́ЧНАЯ ТЭАЛО́ГІЯ, тэалогія крызісу, кірунак у пратэстанцкай евангелічнай тэалогіі, што склаўся ў 1920-я г. ў Германіі і Швейцарыі. Пачатак Д.т. дала праца К.Барта «Тлумачэнне і пасланне апостала Паўла да рымлян» (1919), якая стала маніфестам і праграмай новага руху. Канцэпцыі Д.т. распрацоўвалі таксама Э.Брунер, Р.Бультман, Ф.Гогартэн, П.Тыліх і інш. Д.т. выходзіла з ідэі рання *экзістэнцыялізму* і факта татальнага адчужэння чалавека, абумоўленага стратай Бога або памылковым яго ўсведамленнем. Разуменне Бога ў Д.т. канкрэтызуецца ў ідэі здольнасці асэнсаваць парадаксальнасць быцця, кульмінацыяй якой з'яўляецца спалучэнне божай любові з панаваннем зла ў свеце. Ірацыянальная дыялектыка, якая характарызуе адносіны людзей з Богам, не дазваляе чалавеку спадзявацца на ўласныя сілы і розум, а падае яму толькі надзею на божую ласку. Прадстаўнікі Д.т. аднаўлялі лютэраўскае разуменне тэалогіі, найперш як адносін чалавека і Бога, рэабілітавалі трактоўку веры як асабістага дыялога з Богам. У 1940—60-я г. Д.т. набыла характар выключна акадэмічнай з'явы.

Н.К.Мазоўка.

ДЫЯЛЕКТЫ́ЧНЫ МАТЭРЫЯЛІ́ЗМ, адна з форм матэрыялізму, заснаваная на дыялект. метадзе пазнання рэчаіснасці з'яў і працэсаў прыроднага свету. Засн. ў 19 ст. К.*Марксам* і Ф.*Энгельсам* у выніку крытычнай перапрацоўкі ідэй і высноў ням. класічнай філасофіі, у прыватнасці дыялектыкі Г.*Гегеля* і матэрыялізму Л.*Феербаха*. Атрымаў развіццё ў працах Г.В.*Пляханава* і У.І.*Леніна*, сав. і замежных вучоных-марксістаў. Сістэ-

ма Д.м. абапіраецца на сукупнасць наступных асн. прынцыпаў: матэрыяльнасці свету (сцвярджэнне прымату матэрыі у адносінах да свядомасці); пазнавальнасці рэчаў і з'яў (нашы веды аб навакольным свеце заключаюць у сабе пэўны аб'ектыўны змест, мерай аб'ектыўнасці з'яўляецца грамадска-вытв. практыка); развіцця (няспынныя дыялект. змены навакольнай рэчаіснасці пад уплывам узнікнення, барацьбы і вырашэння процілегласцей яе аб'ектаў і наступнага іх пераходу з аднаго якаснага стану ў іншы). Асаблівая рыса Д.м. — паслядоўнае спалучэнне ў адзіным філас. вучэнні пачаткаў *матэрыялізму* з *дыялектыкай* як метадам пазнання чалавекам навакольнай рэальнасці і гарманічнага ўзаемадзеяння з ёю, а таксама пашырэнне матэрыяліст. і дыялект. палажэнняў на грамадскае жыццё.

Літ.: Маркс К. Тезісы аб Фейербаху // Маркс К., Энгельс Ф. Выбр. творы. Мн., 1952. Т. 2; Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды. Мн., 1954; Ленін У.І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм // Тв. Т. 14 (Полн. собр. соч. Т. 18); Шептулин А.П. Диалектический метод познания. М., 1983; Исторические типы философии. М., 1991. *В.І.Боўш.*

ДЫЯЛЕКТЫ́ЧНЫ МЕ́ТАД, гл. ў арт. *Дыялектыка*.

ДЫЯ́ЛІЗ (ад грэч. dialysis раскладанне, аддзяленне), метад раздзялення растораных рэчываў, малекулярныя масы якіх значна розняцца.

Засн. на рознасці скарасцей *дыфузіі* такіх рэчываў праз мембрану, якая аддзяляе канцэнтраваны і разбаўлены растворы: растораныя рэчывы з рознай скорасцю дыфундзіруюць у бок разбаўленага раствору. Раздзяленне раствору на кампаненты з дапамогай Д. ўпершыню праведзена англ. хімікам Т.Грэмам (1854). Для Д. звычайна выкарыстоўваюць плоскія мембраны на аснове цэлюлозы (цэлафан, купрафан) ці полыя валокны з полісульфону. Выкарыстоўваюць у вытв-сці штучных валокнаў (аддзяленне шчолачы ад геміцэлюлозы) і шэрагу біяхім. прэпаратаў, у медыцыне для лячэння атручэння, нырачнай недастатковасці і інш. хвароб. Гл. таксама *Мембранныя метады раздзялення, Гемадыяліз*.

А.В.Більдзюкевіч.

ДЫЯЛО́Г (ад грэч. dialogos размова, гутарка), размова паміж дзвюма або некалькімі асобамі; функцыянальная разнавіднасць вуснай мовы. Структура Д. не нарматыўная: памеры яго могуць быць самыя розныя, рэплікі ў ім — таксама (ад маналагічна разгорнутых да ўсечаных). Ужываецца ва ўсіх відах літ. творчасці. У прозе побач з аўтарскай мовай Д. выступае адным са сродкаў слоўнага жывапісу, выконвае характаралагічную ролю. У драме Д. — найважнейшы выяўл. сродак, пры дапамозе якога фарміруецца і развіваецца дзея, выяўляюцца характары. Драматургічны Д. удасканальваўся на працягу многіх стагоддзяў, набыў выключнае багацце «інструментоўкі»: разарванасць, дэфармаванасць знешнелагічных сувязей паміж рэплікамі, іх амбівалентнасць, шматгалоссе (перапляценне рэплік многіх персанажаў), падтэкст і інш. Д. вядомы і як самаст. публіцыст. і філас. жанр («Федр» Платона, «Размова гетэр» Лукіяна, «Размова вольных муляраў» Г.Э.Лесінга, «Пляменнік Рамо» Д.Дзідро, «Сын і маці» Я.Купалы і інш.). У пераносным сэнсе Д. — перагаворы, свабодны абмен думкамі, напр., паліт. Д.

ДЫЯМАГНЕТЫ́ЗМ (ад *дыя...* + *магнетызм*), уласцівасць рэчыва намагнічвацца насустрач знешняму магн. полю; адзін з відаў *магнетызму*. Уласцівы ўсім рэчывам; вызначае паводзіны для *дыямагнетыкаў* у магн. полі: неаднароднае поле выштурхоўвае іх у бок з меншай напружанасцю, у аднародным полі прадаўтаваты ўзор арыентуецца ўпоперак да сілавых ліній поля. У найб. ступені выяўляецца для *звышправаднікоў*.

Простая тэорыя Д. газу неўзаемадзейных атамаў створана П.*Ланжэвэнам* і заснавана на вылічэнні магн. моманту, які ўзнікае ў выніку *Лармара прэцэсіі* электронаў на атамных арбітах. Пры ўнясенні цела ў магн. поле ў электроннай абалонцы кожнага яго атама ўзнікаюць індуцыраваныя кругавыя токі, якія ствараюць *магнітны момант*, накіраваны ў адваротнасці з *Ленца правілам* процілегла знешняму полю (незалежна ад таго, ці меў атам уласны магн. момант ці не і як ён быў накіраваны). Электроны праводнасці металаў і паўправаднікоў пачынаюць рухацца па спіральных квантаваных арбітах, што таксама выклікае Д. (гл. *Ландау дыямагнетызм*). Індуцыраваны магн. момант прапарцыянальны напружанасці знешняга магн. поля і не залежыць ад т-ры ўзору (акрамя металаў і паўправаднікоў пры нізкіх т-рах, дзе назіраецца перыяд. змяненне магнітнай успрымлівасці пры павольным павелічэнні напружанасці магн. поля — эфект Дэ Хааза — ван Альфена). Найб. значэнне магн. успрымлівасці маюць звышправаднікі, унутр якіх магн. поле не трапляе; іх Д. абумоўлены макраскапічнымі паверхневымі токамі.

ДЫЯМАГНЕ́ТЫК, рэчыва, якое намагнічваецца ў напрамку, процілеглым знешняму магн. полю. Пад уздзеяннем поля кожны атам Д. набывае магн. момант, прапарцыянальны полю і накіраваны насустрач яму (гл. *Дыямагнетызм*; пры адсутнасці знешняга поля Д. немагнітны). Д. з'яўляюцца інертныя газы, азот, вадарод, вісмут, цынк, медзь, золата і інш. элементы, многія арган. і неарган. злучэнні.

ДЫЯМАГНІ́ТНЫ РЭЗАНА́НС, тое, што *цыклатронны рэзананс*.

ДЫЯМЕ́НТ (ням. Diamant літар. *алмаз*), 1) адна з назваў алмазу, *брыльянт*. 2) Друкарскі *шрыфт*, *кегель* (памер) якога роўны 4 пунктам (1,5 мм).

ДЫЯ́МЕТР (ад грэч. diametros папярочнік) акружнасці (круга), адрэзак прамой, які злучае 2 пункты акружнасці і праходзіць праз яе цэнтр, а таксама даўжыня гэтага адрэзка. Даўжыні ўсіх Д. акружнасці аднолькавыя і роўныя 2 радыусам. Д. канічнага сячэння — прамая, якая праходзіць праз сярэдзіны яго паралельных хордаў. Усе Д. *эліпса* і *гіпербалы* праходзяць праз іх цэнтры. Д. *парабалы* паралельныя яе восі. Д. адвольнай замкнёнай фігуры — найб. адлегласць паміж двума пунктамі гэтай фігуры. У гэтым сэнсе Д., напр., эліпса роўны даўжыні яго вялікай восі; Д. куба — даўжыні яго дыяганалі.



Дыяметр: *а* — эліпса; *б* — гіпербалы; *в* — парабалы.

ДЫЯ́НА, у рымскай міфалогіі багіня расліннасці, жаноцкасці, заступніца шлюбу і дзетанараджэння, увасабленне Месяца — *Селены*. Мела эпітэт Трывія — «багіня трох дарог», як знак трайной улады на небе, зямлі і пад зямлёй. Д. лічылі таксама апякункай Лацінскага саюза. Свяцілішчы Д. былі на гары Тыфаце (вобласць Кампанія, адсюль Д. Тыфаціна) і на Авенціне, дзе 13 жн. быў заснаваны храм (гэты дзень лічыўся святочным для рабоў). У грэч. міфалогіі Д. атаясамлівалі з *Артэмідай* і *Гекатай*.

ДЫЯНЕ́Я (Dionaea), манатыпны род кветкавых раслін сям. расянкавых. 1

Да арт. **Дыянея**. Венерына мухалоўка.

від — Д. венерына мухалоўка (D. muscipula). Пашыраны на Атлантычным узбярэжжы Паўн. Амерыкі. Расце на мохавых балотах і вільготных пясках.

Шматгадовая насякомаедная травяністая расліна з кароткім бязлістым сцяблом (стрэлкай) і разеткай лісця. Кожны ліст мае крылаты чаранок і двухлопасцевую авальную пласцінку, у цэнтры якой знаходзяцца 3 адчувальныя валаскі. Калі насякомае дакранаецца да гэтых валаскоў, лопасці ліста змыкаюцца, утрымліваюць ахвяру і выдзяляюць стрававальную вадкасць, якая ператраўляе яе. Кветкі дробныя, белыя, сабраныя ў парасонападобны шчыток на доўгім кветаносе-стрэлцы. Плод — шматнасенная каробачка. Лек. і дэкар. расліна.

Г.У.Вынаеў.

Да арт. **Дыяна**. Вяртанне Дыяны з палявання. Мастак П.П.Рубенс. Каля 1615.

ДЫЯНІ́С, у грэчаскай міфалогіі бог расліннасці, вінаградарства і вінаробства, сын *Зеўса* і фіванскай царэўны Семелы. Нарадзіўся неданошаным пасля смерці маці, але Зеўс зашыў Д. ў сваім бядры і данасіў. Спадарожнікамі Д. былі *німфы*, дэманы, сатыры і сілены. Першапачаткова Д. ўяўлялі сталым, барадатым мужчынам, пазней — прыгожым юнаком. Святы ў гонар Д. — дыянісіі, мелі характар оргій. Міф пра Д. — часты сюжэт у выяўл. мастацтве (фрэскі ў Пампеях, мазаіка з Дэласа, рэльеф на мануменце Лісікрата ў Афінах, карціны А.Альтдорфера, Тыцыяна, П.П.Рубенса, Д.Веласкеса і інш.). У рымлян вядомы пад імем *Вакх* (Бахус).

ДЫЯНІ́СІЙ (грэч. Dionysios), імя правіцеляў-тыранаў (гл. *Тыранія*) стараж.-грэч. *Сіракузаў*.

Д. І Старэйшы (каля 432—367 да н.э.), тыран [406—367 да н.э.]. Вылучыўся ў час вайны з Карфагенам (408—405 да н.э.). Захапіўшы ўладу, рэарганізаваў армію і флот, праследаваў паліт. праціўнікаў, разбураў грэч. гарады, прадаваў насельніцтва ў рабства, канфіскоўваў землі. У 398—367 да н.э. (з перапынкамі) вёў войны з карфагенянамі за панаванне на тэр. Сіцыліі, Корсікі, Італіі. Ператварыў Сіракузы ў гандл. і культ. цэнтр. Аўтар шэрагу трагедый, вершаў, песень.

Д. II Малодшы, тыран [367—357 і 346—344 да н.э.]. Старэйшы сын Д. I. Праводзіў курс на ліквідацыю органаў нар. дэмакратыі. Спыніў вайну з Карфагенам, якую вёў яго бацька. Каля 357 змагаўся ў Паўд. Італіі з грэч. гарадамі і плямёнамі луканаў, але ўладу ў Сіракузах захапіў сваяк Дыён. У 346 да н.э. зноў авалодаў Сіракузамі, у 344 да н.э. здаў горад карынфскаму палкаводцу Тымалеёну. Быў жрацом багіні Кібелы. Памёр у выгнанні.

Дыяніс. Фрагмент размалёўкі амфары «майстра Клеафрада». Каля 500 да н.э.

Літ.: Фролов Э.Д. Сицилийская держава Дионисия (IV в. до н.э.). Л., 1979.

ДЫЯН'ІСІЙ Балабан (?, Падляшша — 1663), праваслаўны царк. дзеяч Рэчы Паспалітай. Епіскап холмскі, луцкі, з 1650 зноў епіскап холмскі. Адстойваў праваслаўе ад уніяцкага ўціску. Мітрапаліт кіеўскі і ўсяе Русі (ліст. 1657—63). У жн. 1661 па рэкамендацыі канстанцінопальскага патрыярхата і гетмана Украіны І.*Выгоўскага* прызначыў епіскапам магілёўскім і мсціслаўскім Іосіфа Нелюбовіча-Тукальскага, аднак з мая 1661 кафедра была занята епіскапам Мяфодзіем, прызначаным маскоўскім патрыярхатам. Канфліктная сітуацыя прымусіла Д. адысці ад царк. і паліт. спраў. Апошні час жыў у Чыгірыне, застаючыся мітрапалітам намінальна.

Літ.: Карташев А.В. Очерки по истории русской церкви. М., 1991. Т. 2. С. 294—295; Яскевіч А.А. Праблема цэласнасці старабеларускай філалогіі XVI—XVII ст.: Адзінства экзэгезы і герменеўтыкі. Мн., 1996. С. 103—108.

А.А.Яскевіч.

ДЫЯПАЗІТЫ́Ў (ад *дыя...* + лац. positivus дадатны), фатаграфічны каляровы ці чорна-белы пазітыўны відарыс на празрыстай аснове (шкле або плёнцы), які разглядаецца на прасвет ці праецыруецца на экран. Для вырабу Д. выкарыстоўваюць абарачальныя ці спец. дыяпазітыўныя фотаплёнкі або фотапласцінкі. Да Д. часта адносяць рысункі, карціны, чарцяжы, выкананыя на адфіксаваных фотапласцінках ці фотаплёнках. Д. выкарыстоўваюць для навуч., дэманстрацыйных і інш. мэт. Шэраг Д., аб'яднаных агульнай тэмай, складае *дыяфільм*.

ДЫЯПАЗО́Н [ад грэч. dia pasōn (chordōn) праз усе (струны)], 1) у музыцы — гукавы аб'ём пеўчага голасу ці муз. інструмента, гукарада, мелодыі, вак. ці інстр. партыі ў муз. творы і інш. Вызначаецца інтэрвалам паміж самым нізкім і самым высокім гукамі. 2) У фізіцы — вобласць змены якой-н. велічыні, аб'ём чаго-н. Напр., Д. вымярэнняў — вобласць значэнняў вымеранай велічыні, для якой вызначаны хібнасці сродкаў вымярэнняў; Д. паказанняў вымяральнай прылады — вобласць значэнняў шкалы, абмежаваных яе канцавым і пач. паказчыкамі; Д. радыёчастот (радыёхваль) — участкі, на якія ўмоўна падзелена ўся вобласць радыёчастот. 3) У пераносным сэнсе — аб'ём ведаў, здольнасцей, шырыня інтарэсаў, кругагляду, размаху дзейнасці.

ДЫЯПАЗО́ННАЯ АНТЭ́НА, тып *антэны*, асн. эл. параметры якой (дыяграма накіраванасці, уваходнае супраціўленне і інш.) застаюцца практычна нязменнымі ў шырокім дыяпазоне частот (без

падстройкі). Такая ўласцівасць Д.а. абумоўлена выбарам схем і канструктыўных памераў; яе маюць рамбічныя, рупарныя, спіральныя і інш. антэны. Выкарыстоўваюць для радыёсувязі, тэле- і радыёвяшчання.

ДЫЯПАРТА́ЛЬНЫЯ (Diaporthales), парадак сумчатых грыбоў з групы парадкаў пірэнаміцэтаў. Вядома больш за 450 відаў. Пашыраны ў Еўропе і Паўн. Амерыцы. Сапратрофы на раслінных рэштках, некат. — паразіты (пераважна ў канідыяльнай стадыі) пладовых і ягадных культур. На Беларусі адзначаны віды з родаў гнамонія, дыяпортэ, гламерэла, вальса.

Пладовыя цялы (перытэцыі) цёмна-бурыя ці чорныя, шчыльныя, скурыстыя, з носікам для выхаду аскаспор, паглыбленыя ў субстрат або строму (міцэліяльнае спляценне). Сумкі булавападобныя або цыліндрычныя, з часовай ножкай, якая потым знікае, у спелых перытэцыях размешчана свабодна ў слізі. Сумкаспоры адна- або двухклетачныя, бясколерныя.

ДЫЯПА́ЎЗА (ад грэч. diapausis перапынак, прыпынак), стан часовай паніжанай фізіял. актыўнасці жывёл. Характарызуецца рэзкім зніжэннем *абмену рэчываў* і прыпыненнем формаўтваральных працэсаў. Звычайна Д. назіраецца ў зімовы перыяд і служыць прыстасавальнай рэакцыяй. Вылучаюць формы Д.: эмбрыянальную — на стадыі яйца (напр., у калаўротак, ніжэйшых ракападобных, саранчовых), лічынкавую (зімуюць вусені і лічынкі ў многіх матылёў, жукоў-даўганосікаў, ручайнікаў і інш.), кукалкавую (зімуюць кукалкі капуснай бялянкі, капуснай соўкі і інш.), імагінальную (зімуюць дарослыя асобіны камароў, жукоў-лістаедаў і інш.). Для большасці жывёл умераных і высокіх шырот Д. звязана з даўж. светлавога дня.

ДЫЯПІРЫ́ЗМ, працэс утварэння геал. структур. Купалы, антыкліналі ўтварыліся ў выніку нагнятанняў у ядро расплаву магмы, парод паніжанай шчыльнасці і высокай пластычнасці (соль, гіпс, гліна і інш.) з наступным выпіраннем перакрываючых адкладаў або пратыканнем іх з разрывам. Складкі дыяпіравага тыпу падзяляюцца на глыбінныя (магматычныя дыяпіры), покрыўныя (саляныя, гліністыя і інш. дыяпіры; гл. *Саляная тэктоніка*) і паверхневыя ледавіковых парушэнняў (гл. *Гляцыядыслакацыі, Гляцыятэктоніка*).

ДЫЯПРАЭ́КТАР, тое, што *дыяскоп*.

ДЫЯПСІ́Д (ад *ды...* + грэч. opsis выгляд), мінерал з групы *піраксенаў*, сілікат кальцыю і магнію, $CaMg[Si_2O_6]$. Крайні член ізаморфнага раду Д. — гедэнбергіт. Прымесь хрому Cr_2O_3 (да 2% у хромдыяпсідзе). Крышталізуецца ў манакліннай сінганіі. Крышталі прызматычныя, кароткаслупкаватыя. Агрэгаты зярністыя або радыяльна прамяністыя. Колер белы да светла-зялёнага. Празрысты да паўпразрыстага. Бляск шкляны. Цв. 5—6. Шчыльн. 3,3—3,4 г/см^3. Пародаўтваральны мінерал асн. і ультраасн. вывергнутых парод, а таксама кантактава-метасаматычны ў скарнах. Празрыстыя разнавіднасці выкарыстоўваюцца як каштоўныя камяні.

ДЫЯПТА́З (ад *дыя...* + грэч. optazō бачу), мінерал падкласа кальцавых сілікатаў, водны сілікат медзі $Cu_6[Si_6O_{18}] \cdot 6H_2O$. Крышталізуецца ў трыганальнай сінганіі. Крышталі кароткапрызматычныя, слупкаватыя. Агрэгаты прамяністыя і суцэльныя дробназярністыя. Колер ізумрудна-зялёны. Празрысты да паўпразрыстага. Бляск шкляны. Цв. 5. Шчыльн. 3,3 г/см^3. Трапляецца ў зоне акіслення меднарудных радовішчаў разам з малахітам, кальцытам, кварцам і інш. Д. кампанент некат. *медных руд*. Празрыстыя крышталі («медны ізумруд») выкарыстоўваюць у ювелірнай справе.

Дыяпсід.

Дыяптаз.

ДЫЯПТРЫ́Я, пазасістэмная адзінка *аптычнай сілы* лінзы ці сістэмы лінзаў. Аптычная сіла, выражаная ў Д., роўна адваротнай велічыні гал. фокуснай адлегласці лінзы, вызначанай у метрах. Абазначаецца дптр. 1 дптр = 1 м$^{-1}$.

ДЫЯРА́МА (ад *дыя...* + грэч. horama від, відовішча), від жывапісу, у якім стужкападобная карціна нацягнута на ўнутр. паверхні паўкруглага ў плане падрамніка; спалучаецца з аб'ёмным (бутафорскім) пярэднім планам, макетамі. Разлічана на штучнае асвятленне. Вял. Д. размешчаны ў спец. будынках.

Стварае ілюзію шырокіх прастораў і паказвае пераважна батальныя сцэны. У адрозненне ад *панарамы* ахоплівае толькі частку гарызонту. Д. ствараецца з 19 ст. Першапачаткова жывапісныя выявы выконваліся па абодвух баках матэрыялу, які прасвечваўся. Пры змене напрамку і інтэнсіўнасці асвятлення змянялася і бачная гледачу карціна. Першую такую Д. стварыў Л.Ж.Дагер у Парыжы (1822). У сучасным мастацтве такія Д. часам выкарыстоўваюць ў *тэатральна-дэкарацыйным мастацтве*.

З вядомых Д. у бел. мастацтве «Фашысцкі лагер смерці Малы Трасцянец» (1968, Я.Красоўскі, І.Пешкур), «Мінскі касцёл» (1969—71, П.Крохалеў, У.Лагун, Л.Асядоўскі, Б.Аракчэеў; абедзве ў Бел. дзярж. музеі гісторыі Вял. Айч. вайны), «Абарона Брэсцкай крэпасці»

Дыярама «Ф.Скарына трымае экзамен перад прафесарамі Падуанскага універсітэта». Мастак П.Драчоў. 1991—96.

(1957, П.Дурчын, Ф.Зільберт, Брэсцкі абл. краязнаўчы музей), «Ф.Скарына трымае экзамен перад прафесарамі Падуанскага універсітэта» (1991—96, П.Драчоў, Музей медыцыны ў Мінску).

ДЫЯРБАКЫ́Р (Diyarbakir), горад на ПдУ Турцыі, на р. Тыгр. Адм. ц. іля (адм. адзінка) Дыярбакыр. 381,1 тыс. ж. (1990). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: тэкст., харч., маш.-буд., аўтазборачная. Саматужны выраб тканін і саф'яну. 2 ун-ты. Арх. помнікі: цытадэль 4—12 ст., гар. муры 11—12 ст., мячэці 12 і 16 ст., медрэсэ 12 ст. (цяпер музей).

ДЫЯРВІ́ЛА (Diervilla), род кветкавых раслін сям. бружмелевых. Вельмі блізкі да роду *вейгела*. 5 відаў. Пашыраны ў Паўн. Амерыцы і Усх. Азіі. На Беларусі 3 інтрадукаваныя віды: Д. бружмелевая (D. lonicera), сядзячалістая (D. sessilifolia) і прырэчная, або ручаёвая (D. rivularis). Вырошчваюцца пераважна ў бат. садах, дэндрарыях і парках. Размнажаюцца насеннем і вегетатыўна.

Лістападныя кусты выш. да 2 м з разгалінаванымі парасткамі і шчыльнай шарападобнай кронай. Лісце простае, супраціўнае, авальна-выцягнутае або падоўжанае, бліскучае, па краі пілаватае. Кветкі двухполыя, няправільныя, зеленавата-жоўтыя, даўж. да 1 см, у гронкападобных або мяцёлчатых суквеццях. Плод — 2-гнездавая каробачка. Дэкар. расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ДЫЯРЫ́Т (франц. diorite ад грэч. diorizō размяжоўваю, адрозніваю), глыбінная поўнакрышталічная магматычная горная парода, складзеная з плагіяклазу (андэзіну ці алігаклазу) і звычайна рагавой падманкі, радзей аўгіту і біятыту, зрэдку — кварцу (кварцавы Д.). Структура буйна- і тонказярністая, раўнамерна-, нераўнамерназярністая, парфірападобная. Колер шэры да зеленавата-шэрага. Шчыльн. 2700—2900 кг/м^3. Утварае буйныя інтрузіі ў выглядзе баталітаў, штокаў. Пашыраны ў крышт. фундаменце Беларусі. На Пд рэспублікі (р.п. Мікашэвічы) мае прамысл. значэнне. Выкарыстоўваецца як буд. матэрыял, на брук і як аблiцовачны камень; некаторыя гатункі — дэкар. камяні.

ДЫЯ́РЫУШ (ад лац. diarium *дзённік*), жанр гістарычна-дакументальнай прозы ў стараж. бел. і польскай л-ры, у якім падзеі грамадска-паліт. або прыватнага жыцця пададзены ў форме датаваных запісаў. На станаўленне жанру ўплывалі летапісы і хронікі, у якіх у 16 ст. выявілася тэндэнцыя да «алітаратурвання» храналагічных запісаў. У 17—18 ст. Д. называліся дзелавыя і аўтабіягр. запісы, сямейныя хронікі, дзённікі падарожжаў і ваен. паходаў, мемуары; каштоўныя гіст. крыніцы — сеймавыя Д. Найб. ранні бел. помнік гэтага жанру — «Дзённік» Фёдара Еўлашоўскага (канец 16 — пач. 17 ст.). Ваенным падзеям і нац.-вызв. барацьбе прысвечаны дыярушы С. і Б.Маскевічаў (1630, 1649, 1660). Да гэтага жанру належаць творы І.Будзілы (1612), Я.Сапегі (1612), Афанасія Філіповіча (1646), С.Незабітоўскага, Я.Цадроўскага, сямейная хроніка Абуховічаў і інш. *А.Ф.Коршунаў.*

ДЫ́ЯС (Díaz) Парфірыо (15.9.1830, г. Аахака, Мексіка — 2.7.1915), палітычны і дзярж. дзеяч Мексікі, генерал. У гады рэвалюцыі і грамадз. вайны 1854—60 змагаўся на баку лібералаў супраць кансерватараў. У час франц. інтэрвенцыі ў Мексіку (1861—67) камандаваў атрадамі патрыят. арміі. У 1877—80 прэзідэнт Мексікі. У 1884 зноў стаў прэзідэнтам, устанавіў дыктатарскі рэжым. Пры ім узмацнілася эканам. залежнасць Мексікі ад Вялікабрытаніі і ЗША. Скінуты ў 1911 у час *Мексіканскай рэвалюцыі 1910—17.*

Дыяскуры выкрадаюць дачок Леўкіпа. Фрагменты размалёўкі гідрыі. Каля 410 да н.э.

ДЫ́ЯС (Díaz) Хасэ (3.5.1895, г. Севілья, Іспанія — 20.3.1942), палітычны дзеяч Іспаніі, дзеяч міжнар. камуніст. руху. У 1920-я г. адзін з кіраўнікоў прафс. руху ў Севільі. Праследаваўся ўладамі. З 1926 чл. Камуніст. партыі Іспаніі, з 1932 яе ген. сакратар. Чл. Выканкома Камінтэрна ў 1935—42. Адыграў значную ролю ў стварэнні ў Іспаніі *Народнага фронту* (1936) і Нар. арміі, якая ў грамадз. вайну 1936—39 ваявала на баку рэспубліканцаў супраць франкістаў. У 1939 эмігрыраваў у СССР. У 2-ю сусв. вайну выступаў супраць ушчагвання ў яе Іспаніі на баку фаш. Германіі.

ДЫ́ЯС ДЭ МЕНДО́СА (Díaz de Mendoza) Фернанда (7.7.1862, г. Мурсія, Іспанія — 20.10.1930), іспанскі акцёр і тэатр. дзеяч. Творчую дзейнасць пачаў у 1895 у Мадрыдзе. У 1896—1906 кіраўнік (з М.*Герэра*) трупы «Герэра—Мендоса». У 1929 арганізаваў у Буэнас-Айрэсе т-р «Сервантэс», які стаў правадніком іспр. тэатр. культуры ў краінах Лац. Амерыкі. Значную ўвагу аддаваў пастаноўкам п'ес класікаў нац. драматургіі (Лопэ дэ Вэгі, П.Кальдэрона, Тырса дэ Маліны, А.Марэты) і тагачасных аўтараў (Х.Эчэгарай-і-Эйсагірэ, Х.Бенавентэ-і-Марцінеса, братоў С. і Х.Альварэсаў Кінтэра), садзейнічаў фарміраванню творчасці шэрагу іспр. і аргенцінскіх акцёраў 20 ст.

ДЫЯСКО́П (ад *дыя...* + *...скоп*), дыяпраектар, оптыка-механічная прылада для праецыравання з павелічэннем відарысаў празрыстых арыгіналаў (*дыяпазітываў, дыяфільмаў* і інш.) на ўбудаваны ў прыладу або насценны экран. Д. выкарыстоўваюць для дэманстрацыі рысункаў, чарцяжоў, чытання мікрафотакопій і інш. Разнавіднасць Д. — фільмаскоп.

ДЫЯСКУ́РЫ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі сыны *Зеўса* і Леды, браты *Алены*, героі-блізняты — смяротны Кастар і бессмяротны Палідзеўк, удзельнікі паходу *арганаўтаў*. Сімвал братэрскай любві. Культ. Д. першапачаткова існаваў у Спарце, пазней распаўсюдзіўся ва ўсёй Стараж. Грэцыі. У Стараж. Рыме яны былі вядомы як Кастар і Палукс. Міф пра Д. папулярны ў л-ры (Піндар, Тэакрыт, Авідзій), выяўл. мастацтве (вазапіс, П.П.Рубенс, А.Дзюрэр), музыцы (Ж.Ф.Рамо, Дж.Сарці).

ДЫЯ́СПАРА (ад грэч. diaspora рассейванне), пражыванне значнай ч. народа (этн. супольнасці) па-за межамі той краіны, дзе жыве асн. ч. народа. Утваралася ў выніку гвалтоўнага высялення, пагрозы генацыду, эканам. і геагр. фактараў. Першапачаткова Д. — вобласці па-за межамі Палесціны, дзе жылі яўрэі, асабліва ў часы *Вавілонскага палону* пасля выгнання іх у пач. 6 ст. да н.э. *Навухаданосарам II*, а ў 1—2 ст. н.э. — рымлянамі. Паступова тэрмін Д. стаў выкарыстоўвацца і да інш. рэліг. і этн. груп, якія жывуць у новых раёнах рассялення. Гл. таксама *Дыяспара беларуская*.

ДЫЯ́СПАРА БЕЛАРУ́СКАЯ, частка бел. народа, якая жыве па-за межамі Беларусі. У канцы 19 ст. — 1980-я г. ахоплівала ад $^1/_6$ да амаль $^1/_3$ часткі бел. нацыі. У пач. 1990-х г. за межамі Рэспублікі Беларусь пражывала 3—3,5 млн. беларусаў.

У розных гіст. умовах перасяленне насельніцтва з бел. зямель у інш. рэ-

гіёны было выклікана эканам., паліт., ваен., рэліг. і інш. прычынамі. Ранняя эміграцыя найчасцей праяўлялася ў форме ўцёкаў з ВКЛ пакрыўджаных ці незадаволеных яго палітыкай прадстаўнікоў пануючага саслоўя. Для натуральнай эміграцыі з бел. зямель былі і прававыя падставы. Так, паводле *прывілея 1447* Казіміра IV (пазней замацаваны ў Статуце ВКЛ 1529) князі, рыцары, шляхта і баяры маглі пакідаць дзяржаву «для лепшого щастья набытья», навучання ваен. майстэрству. Статуты ВКЛ 1566 і 1588 пацвердзілі права вольных людзей розных саслоўяў на лячэнне, набыццё адукацыі, навучанне рамяству за мяжой. Многія з вольных людзей, якія выязджалі ў замежныя краіны, пакідалі там добрую спадчыну, садзейнічалі пашырэнню кнігадрукавання і асветы (Ф.Скарына, П.Мсціславец, Сімяон Полацкі, І.Капіевіч і інш.). У 15—16 ст. дзесяткі маладых людзей з бел. зямель ВКЛ вучыліся ў еўрап. ун-тах. Значны рост перасяленняў на У у канцы 16—17 ст. быў выкліканы больш раннім узмацненнем прыгоннай эксплуатацыі сялян у ВКЛ, нац.-рэліг. ўціску ў Рэчы Паспалітай. У 17—18 ст. у ходзе войнаў Расіі з Рэччу Паспалітай і інш. дзяржавамі ў глыб імперыі перасяляліся ваеннапалонныя і нямала цывільных жыхароў з бел. зямель. Выхадцы з Беларусі і прымусова пераселеныя сяляне, рамеснікі, гандляры, шляхта садзейнічалі гасп. асваенню Паволжа і Сібіры, некаторыя з іх займалі высокія дзярж. і ваен. пасады, сталі заснавальнікамі купецкіх родаў, узбагачалі культ. жыццё ў месцах свайго пражывання. Перасяленцы з бел. зямель і іх нашчадкі былі пачынальнікамі геагр. і этнагр. вывучэння новых каланізаваных Расіяй тэрыторый, карэнных народаў Прыуралля, Сібіры, Чукоткі, Камчаткі (А.Каменскі, Л.Сеніцкі і інш.). У 2-й пал. 17 ст. дзесяткі майстроў-рамеснікаў з Полацка, Віцебска, Оршы, Шклова, Магілёва і інш. гарадоў працавалі ў Аружэйнай палаце, аздаблялі церамы Крамля, Каломенскі палац, Новадзявочы, Данскі і Нова-Іерусалімскі (на Істры) манастыры. Яны прынеслі ў Рус. дзяржаву новыя рамёствы, свой адметны стыль, матывы і тэхніку скульпт. разьбы па дрэве («беларуская рэзь»), вырабу шматколернай кафлі. Падзелы Рэчы Паспалітай 1772, 1793, 1795 і развіццё ў канцы 18—19 ст. нац.-вызв. руху на Беларусі вызначылі паліт. прычыны эміграцыі, асабліва пасля паўстанняў 1794, 1830—31, 1863—64. Некаторыя з іх уключыліся ў рэв. і вызв. рух у Еўропе і Амерыцы (Т.Касцюшка, В.Урублеўскі, М.Судзілоўскі, З.Мінейка і інш.), садзейнічалі развіццю культуры і навукі краін свайго пражывання, узбагачалі тым самым і бел. спадчыну (І.Дамейка, Г.Дмахоўскі, Н.Орда, А.Рыпінскі, К.Ельскі і інш.). Паводле перапісу 1897, у Рас. імперыі за межамі губерняў пераважна з бел. насельніцтвам (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская) пражывала каля 500 тыс. беларусаў. Даследчыкамі прыроды, побыту, традыцый народаў Сібіры, Д. Усходу, Казахстана сталі сасланыя І.Чэрскі, Э.Пякарскі, А.Янушкевіч, Б.Дыбоўскі, В.Кавалеўскі. Узбагачэнню рус. прыродазнаўчай навукі спрыяла творчая спадчына вучоных — выхадцаў з Беларсі В.Ермакова, У.Брайцава, А.Садоўскага, Ж.Урублеўскага, У.Урублеўскага, У.Кавалеўскага, А.Кавалеўскага.

Першая хваля масавай працоўнай міграцыі бел. насельніцтва ў іншаэтнічныя рэгіёны Рас. імперыі (усходняя) і за яе межы (заходняя) пракацілася на рубяжы 19—20 ст. Да 1-й сусв. вайны па эканам. прычынах толькі ў Сібір з Беларусі перасялілася (пераважна сяляне) больш за 700 тыс., за межы Расіі — 500—800 тыс. чал. (пераважна ў ЗША, Канаду, Бразілію, Аргенціну, краіны Зах. Еўропы). Па-за этн. межамі ўзніклі першая асв. арг-цыя «Крывіцкі вязок» (1868), першая самастойная паліт. арг-цыя бел. інтэлігенцыі «Гоман» (1884, абедзве ў Пецярбургу), «Беларускае студэнцкае зямляцтва» ў Варшаве (1908—1914), Беларускі навук.-літ. гурток у Санкт-Пецярбургу (1912—14). У 1914 зарэгістравана першае супольнае Т-ва беларусаў і маларосаў (ЗША, штат Мічыган). У многіх рус. асяродках ЗША і Канады беларусы складалі значную ці нават большую частку, былі заснавальнікамі многіх правасл. цэркваў, прыходаў, удзельнікамі грамадска-культ. жыцця.

1-я сусв. вайна 1914—18, Лют. і Кастр. рэвалюцыі 1917, герм. і польская акупацыі Беларусі выклікалі значны адток бел. насельніцтва на У Расіі (246 тыс. бежанцаў і эвакуіраваных пасля не вярнуліся на радзіму), вываз ваеннапалонных у Германію, выезд больш за 120 тыс. чал. у Літву, Латвію, Эстонію, Чэхаславакію, Турцыю і інш. краіны. За мяжой з'явілася першая арганізаваная паліт. эміграцыя (урад і вайск. фарміраванні БНР, кіраўніцтва партыі бел. эсэраў і інш.). Працоўная (сялянская) эміграцыя звязана з выездам у Амерыку і Еўропу (каля 180—250 тыс. жыхароў Зах. Беларусі, якая знаходзілася пад уладай Польшчы). Найбольшай актыўнасцю і нац.-культ. дзейнасцю ў міжваенны перыяд вызначалася Д.б. ў Літве, Латвіі, Чэхаславакіі, ЗША, Францыі, Аргенціне (існавалі т-вы, нац. друк, асвета). З БССР у 1926—38 у інш. рэгіёны СССР перасялілася больш за 600 тыс. чал. (планавы набор рабочай сілы, дэпартацыі, паліт. рэпрэсіі і інш.). Рассеяныя па абшарах дзяржавы беларусы стварылі дзесяткі грамадскіх, культурна-асветных арг-цый, якія ў 1930-я г. спыніліся сваю дзейнасць. У выніку 2-й сусв. вайны амаль 1,5 млн. беларусаў эвакуіравалася на У і толькі трэцяя частка з іх вярнулася ў БССР; у ліку сав. ваеннапалонных за мяжой апынулася шмат беларусаў, каля 400 тыс. вывезена ў Германію (240 тыс. з іх не вярнуліся). Да сак. 1946 у СССР рэпатрыіравана 520 тыс. беларусаў. Аснову Д.б. склалі таксама члены бел. арг-цый, устаноў, вайск. фарміраванняў на акупіраванай тэр., якія выехалі на Захад. Пасля вайны Д.б. за межамі СССР папаўнялася нязначна. Рэгулярны прыток беларусаў і выхадцаў з Беларусі ў зах. краіны пачаўся ў 1980-х г. У 1988—90 з БССР эмігрыравала больш за 52 тыс. чал. У 1991—95 за межы Рэспублікі Беларусь выехала каля 55 тыс. чал.: у Ізраіль (50%), ЗША (32%), Германію, Аўстралію, Польшчу, Канаду. Па неафіц. звестках у 1995 каля 500 тыс. беларусаў пражывала ў ЗША, каля 100 тыс. у Канадзе, дзесяткі тысяч у Аргенціне, Бразіліі, Францыі, Бельгіі, Германіі, Вялікабрытаніі і Аўстраліі. Прыкладна 250—400 тыс. беларусаў Белласточчыны апынуліся ў Польшчы пасля вызначэння паслявае. дзярж. граніц. Пасля распаду СССР на абшарах новых незалежных дзяржаў апынулася больш за 2 млн. беларусаў. У 1992—95 Беларусь прыняла з новых незалежных дзяржаў 287 тыс. асоб, з якіх амаль 150 тыс. беларусаў. На постсавецкай прасторы цяпер сканцэнтравана пераважная большасць усіх замежных беларусаў. На 1996 у Расіі іх больш за 1 млн. 100 тыс. чал., на Украіне больш за 400 тыс., у Казахстане — 170 тыс., Латвіі — амаль 100 тыс., Літве — 50 тыс., Эстоніі — 25 тыс. За межамі Рэспублікі Беларусь частка беларусаў пражывае на этнічных землях, якія ў 1920—40 адышлі да інш. дзяржаў. Духоўнай асновай нац. самавызначэння, праявай самабытнасці, адметнасці сталі створаныя беларусамі ў замежжы грамадскія, паліт., асв.-культ., навук., рэліг. арг-цыі, суполкі мастакоў, нац. друк і асвета, культ. цэнтры, музеі і архівы, маст. калектывы, пабудаваныя храмы. За мяжой дзейнічаюць Бел. аўтакефальная правасл. царква, Бел. правасл. царква ў юрысдыкцыі канстанцінопальскага патрыярха, Бел. каталіцкія (уніяцкія) місіі ў Чыкага, Лондане, Парыжы. Царк.-рэліг. жыццё на нац. аснове складваецца і на постсавецкім абшары (Масква, Санкт-Пецярбург, Рыга). Захаванню нац. свядомасці, пашырэнню звестак пра беларусаў спрыяюць Бел.-амер. задзіночанне, Бел. нац. аб'яднанне, Бел. кангрэсовы камітэт, Бел.-амер. рада ў Чыкага (усе ў ЗША), Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі, Згуртаванне беларусаў Канады, Федэрацыя бел. арг-цый у Аўстраліі, Бел. хаўрус у Францыі, жаночыя, маладзёжныя і інш. арг-цыі; правядзенне традыц. сустрэч беларусаў Паўн. Амерыкі (з 1952 адбыліся 22 сустрэчы), Аўстраліі (з 1976 — 12 сустрэч); перыяд. друк, у т.л. штомесячная газета «Беларус» (у ЗША ў 1980-я г. выходзіла 15 выданняў на бел. мове). Нац.-культ., сац.-паліт. інтарэсы беларусаў Польшчы выражаюць паліт. партыя Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне, Бел. аб'яднанне студэнтаў і інш. т-вы, згуртаваныя ў Раду бел. арг-цый і Бел. Саюз, Бел. грамадска-культ. т-ва, газета «Ніва» і інш. З канца 1980-х г. пачаўся працэс нац.-культ.

гуртавання беларусаў СССР. Пра дынаміку іх арганізац. аб'яднання на постсавецкай прасторы сведчыць грамадская культ.-асв. дзейнасць у 1997 больш за 80 бел. суполак, т-ваў, згуртаванняў, цэнтраў у Расіі, на Украіне, у Малдове, Латвіі, Літве, Эстоніі, Казахстане, Кыргызстане, Узбекістане. Цэнтры навук.-культ. жыцця Д.б.: Беларускі ін-т навукі і мастацтва ў Нью-Йорку, Англа-бел. т-ва, Б-ка і музей імя Ф.Скарыны ў Лондане, філіял Бел. ін-та навукі і мастацтва ў Таронта (Канада), Бел. гіст. т-ва ў Беластоку (Польшча), Вялікалітоўскі фонд імя Л.Сапегі, фундацыя імя П.Крачэўскага (ЗША) і інш. Асяроддзе замежных беларусаў вылучыла вядомых людзей у розных галінах навукі, літаратуры і мастацтва. Парт.-дзярж. колы БССР і СССР у адносінах да Д.б. вялі палітыку яе непрызнання, ізаляцыі паліт. эміграцыі ад Бацькаўшчыны, расколу яе па ідэалаг. адзнаках. Створанае Бел. т-ва па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом (1964, з 1976 — Бел. т-ва «Радзіма») трымала сувязь толькі з арг-цыямі, якія лаяльна ставіліся да сацыяліст. ладу. Недаацэньваліся нац.-культ. патрэбы суродзічаў у іншаэтнічных раёнах СССР. З пачаткам працэсаў дэмакратызацыі, нац. адраджэння, паліт. і эканам. рэформ узніклі ўмовы для пераасэнсавання ролі Д.б. З канца 1980-х г. новыя грамадскія рухі на Беларусі сталі ініцыятарамі ўсталявання з ёй сталых зносін. Істотныя змены ў адносінах Д.б., у т.л. і на дзярж. узроўні, пачаліся, калі Беларусь атрымала незалежнасць. Дзейнічае згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» (з 1990), падтрымку ўрада атрымалі яго ініцыятывы агульнанац. маштабу — *Першы сход беларусаў блізкага замежжа* (снеж. 1992), *Першы з'езд беларусаў свету* (ліп. 1993). У ліп. 1997 адбыўся Другі з'езд беларусаў свету. Вырашэнню праблем Д.б. спрыялі прынятае Закона аб грамадзянстве (1991), Закона аб парадку выезду і ўезду (1993), уключэнне ў шэраг падпісаных Рэспублікай Беларусь міжнар. дагавораў (з Расіяй, Польшчай, Украінай, Кыргызстанам, Казахстанам і інш.) артыкулаў аб магчымасці свабоднага выяўлення, захавання і развіцця суайчыннікамі этнічнай, культ., моўнай, рэліг. самабытнасці, прынятае дзярж. праграмы «Беларусы ў свеце». Гл. таксама *Эміграцыя*.

Літ.: Абецедарский Л.С. Белорусы в Москве XVII в. Мн., 1957; Верещагин П.Д. Крестьянские переселения из Белоруссии (Вторая половина XIX в.). Мн., 1978; Грыцкевіч В.П. Нашы славутыя землякі. Мн., 1984; Яго ж. От Немана к берегам Тихого океана. Мн., 1986; Сачанка Б.І. Беларуская эміграцыя. 2 выд. Мн., 1991; Скарыніч. Вып. 1—3. Мн., 1991—97; Антонава Т. У землякоў за акіянам. Мн., 1992; Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн., 1993; Сяргеева Г. Беларуская дыяспара // Крыжовы шлях. Мн., 1993; Культура беларускага замежжа. Кн. 1—3. Мн., 1993—94; Туга па Радзіме. Мн., 1992; Пранчак Л.І. Беларуская Амерыка. Мн., 1994. *Г.Г.Сяргеева.*

ДЫЯСПО́Р (ад грэч. diaspora рассейванне), мінерал падкласа гідраксідаў, гідраксід алюмінію $HAlO_2$. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Крышталі тонкапласціністыя, таблітчастыя, слупкаватыя. Агрэгаты лісцеватыя або тонкалускаватыя. Колер шэры, белы, жаўтавата-буры, чырванаваты, зялёны. Бляск шкляны. Крышталі празрыстыя да паўпразрыстых. Цв. 6,5—7. Крохкі. Шчыльн. 3,2—3,5 г/см^3. Пры награванні каля 575 °С ператвараецца ў *карунд*. Паходжанне пераважна кантактава-метасаматычнае і экзагеннае. Пашыраны ў радовішчах баксітаў. Выкарыстоўваецца як руда на алюміній, вогнетрывалы і абразіўны матэрыял.

Дыяспор.

ДЫЯ́СТАЛА (ад грэч. diastolē расшырэнне), фаза сардэчнага цыкла: расшырэнне поласцей сэрца, звязанае з расслабленнем мускулатуры іх сценак, у час якога поласці сэрца напаўняюцца крывёю. Паслядоўныя *сістала* (скарачэнне) і Д. перадсэрдзяў і жалудачкаў — цыкл сардэчнай дзейнасці. Пры рытме 75 за мін (у чалавека) Д. перадсэрдзяў доўжыцца 0,7 с, Д. жалудачкаў — каля 0,5 с.

ДЫЯСТЭРЭАМЕ́РЫ, дыястэрэаізамеры (ад *дыя...* + *стэрэа...* + *ізамеры*), прасторавыя ізамеры з некалькімі элементамі *хіральнасці* (асіметрычнымі цэнтрамі), але з рознай канфігурацыяй часткі з іх. Д. адрозніваюцца адзін ад аднаго велічынёй аптычнага вярчэння і не з'яўляюцца аптычнымі антыподамі. Маюць розныя фіз. (т-ры кіпення і плаўлення, растваральнасць і інш.) і некат. хім. ўласцівасці, напр., D-(+)-вінная і *меза*-вінная кіслоты. Адзін з метадаў атрымання аптычна актыўных рэчываў — расшчапленне *рацэматаў*, заснаваны на ўтварэнні пары Д. і іх наступным раздзяленні фіз. метадамі (напр., крышталізацыяй). Гл. таксама *Аптычная ізамерыя, Ізамерыя*.

Л.М.Скрыпнічэнка.



Дыястэрэамеры D-(+)-вінная (I) і *меза*-вінная (II) кіслоты.

ДЫЯТАМІ́Т (ад позналац. Diatomeae дыятомавыя водарасці), зямлістая рыхлая ці слабасцэментаваная асадкавая горная парода, утвораная пераважна з ракавінак *дыятомавых водарасцей*. Мае ад 62 да 97% воднага крэменязёму (апалу), пастаянныя прымесі гліністых мінералаў. Колер белы, светла- ці жаўтавата-шэры, зрэдку цёмна-шэры. Характарызуецца вял. порыстасцю, адсарбцыйнымі і ізаляцыйнымі ўласцівасцямі. Паходжанне Д. марское, азёрнае ці балотнае. На Беларусі выяўлены пераважна ў александрыйскіх (магутнасць да 20 м, Мінскае ўзв.) і муравінскіх (у прыродным агаленні Панямунь паблізу Гродна) адкладах. Выкарыстоўваецца ў буд., харч., нафтавай і хім. прам-сці.

ДЫЯТО́МАВЫ МУЛ, асадак на дне сучасных акіянаў, мораў і азёр, які складаецца пераважна з апалавых панцыраў *дыятомавых водарасцей* і іх абломкаў. Найб. пашыраны ў акіянах умераных шырот Паўд. паўшар'я, назіраецца ў выглядзе суцэльнага пояса вакол Антарктыды. У выкапнёвым стане Д.м. пераходзіць у асадкавую горную пароду — *дыятаміт*.

ДЫЯТО́МАВЫЯ ВО́ДАРАСЦІ, крамяністыя водарасці (Diatomeae, Bacillariophyta), аддзел водарасцей. Налічваюць каля 300 родаў, больш за 19 тыс. сучасных і выкапнёвых відаў. Пашыраны ва ўсіх тыпах вадаёмаў і ў глебе па ўсім зямным шары. Вядомыя з юрскага перыяду. Па форме панцыра (асн. сістэм. прыкмета) падзяляюцца на 2 класы: цэнтрычныя (Centricae) і пенатныя (Pennatae). На Беларусі адзначана каля 930 відаў, разнавіднасцей і форм з 47 родаў: актынела, анамеонеіс, атэя, ахнантэс, бацылярыя, гамфанема, дыятома, калонеіс, таласіёзіра, мелазіра, навікула, ніцшыя, пінулярыя, фрагі-



Дыятомавыя водарасці: 1 — навікула востраканцовая; 2 — дыплонеіс перарваны; 3 — ніцшыя сігмападобная; 4 — каконеіс педыкула; 5 — фрагілярыя сярэдняя; 6 — мелазіра зярністая.

лярыя, цымбела і інш. Д.в. — найважнейшыя прадуцэнты арган. рэчыва (каля 25% сусветнай першаснай прадукцыі, што ствараюць расліны), актыўныя ўдзельнікі самаачышчэння вод, індыкатары забруджвання вадаёмаў. Вялікая колькасць створак Д.в. складае горную пароду дыятаміт.

Аднаклетачныя, мікраскапічныя (ад 4 да 2000 мкм) адзіночныя або каланіяльныя рухомыя арганізмы. У іх характэрная асаблівасць — цвёрдая з 2 палавінак (створак) крэменязёмная абалонка. Хларапласты маюць хларафілы *a* і *c* і фукаксанцін, які надае Д.в. буры колер. Назапашваюць алей, валюцін і хрызаламінарын. Размнажаюцца дзяленнем і палавым шляхам (ізагамія бязжгуцікавых гамет, кан'югацыя, аўтагамія або аагамія). У палеанталогіі выкарыстоўваюць дыятомавы аналіз, заснаваны на вызначэнні таксанамічнай прыналежнасці выкапнёвых Д.в.

ДЫЯТО́НІКА (грэч. diatonikos літар. расцягнуты, г.зн. які пераходзіць ад аднаго тону да другога) у м у з ы ц ы, сяміступенная інтэрвальная сістэма, усе гукі якой могуць быць размешчаны па чыстых квінтах. *Інтэрвалы* Д. ўтвараюцца ў межах ланцуга з 6 квінтаў; дыятанічныя і ўсе *акорды*, якія ўключаюць толькі інтэрвалы Д. Гэтыя інтэрвалы дыятанічныя і тады, калі яны ўтвараюцца храматычнымі ступенямі (напр., des-f у C-dur, гл. *Храматызм*). Тое ж адносіцца і да акордаў. Адрозніваюць інтэрвалы і акорды ўласна дыятанічныя (напр., c-e-g-h у C-dur) і дыятанічныя па сутнасці, але храматычныя паводле становішча (напр., c-e-g-h у H-dur). У цэлым Д. ўласцівы строгасць тону, характар прастаты, «натуральнасці». Да Д. адносяцца гукарады стараж.-грэч. ладоў, царк. ладоў, ладоў нар. музыкі. Блізкія да Д. лады, аснова якіх — дыятанічны гукарад, але якія маюць і храматычныя інтэрвалы (зах.-еўрап. царк. гукарад, гарманічны мажор і мінор і інш.). Яны ўмоўна адносяцца да Д. і складаюць міксадыятанічны (мяшанадыятанічны) род інтэрвальных сістэм.

Структура стараж. (ант., сяродневяковай) Д. была квінтавая. Па меры развіцця акордава-гарманічнай сістэмы Д. структурна рэарганізавалася, стала квінтава-тэрцавай, якая ляжыць у аснове класічнай функцыянальнай *тональнасці*. У сувязі з незамкнёнасцю раду 6 квінтаў і, адпаведна, магчымасцю шматразовай транспазіцыі ўзнікае вял. мадуляцыйная прастора — база буйных класічных форм. У 19—20 ст. шырока ўводзіцца Д. нар. складу (у Ф.Шапэна, Э.Грыга, А.Лядава, М.Мусаргскага, С.Пракоф'ева, М.Рымскага-Корсакава, Г.В.Свірыдава, І.Стравінскага, бел. кампазітараў А.Багатырова, Г.Гарэлавай, І.Лучанка, А.Мдывані, Дз.Смольскага, Л.Шлег і інш.). У 20 ст. пашырана дысанантная Д.

Літ.: К а т у а р Г.Л. Теоретический курс гармонии. Ч. 1—2. М., 1924—25; С п о с о б и н И.В. Лекции по курсу гармонии. М., 1969; К о т л я р е в с ь к и й І.А. Діатоніка і хроматика як категорії музичного мислення. Київ, 1971; Д у б к о в а Т.А. Натуральналадавыя сродкі ў творчасці беларускіх кампазітараў // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1964. № 4. *Ю.М.Халопаў.*

ДЫЯТРЭ́МА, тое, што *трубка выбуху*.

ДЫЯТЭ́З (ад грэч. diathesis схільнасць), стан арганізма, пры якім фізіял. раздражняльнікі могуць быць прычынай паталаг. змен. Д. звязваюць са спадчыннымі, прыроджанымі і набытымі ўласцівасцямі, на якія ўплывае асяроддзе. Найчасцей бывае ў дзяцей. Адрозніваюць 3 формы Д.: эксудатыўна-катаральны (у дзяцей ранняга ўзросту, да 2—3 гадоў знікае) з высыпкай на скуры і слізістых абалонках, запаленнямі дыхальных шляхоў і хваробамі стравальна-кішачнага тракту; лімфатыка-гіпапластычны (выяўляецца ў 2—7 гадоў) з паніжанай устойлівасцю і схільнасцю да хвароб эндакрынных залоз і нерв. сістэмы; нервова-артрытычны (бывае рэдка, у 7—14 гадоў) з парушэннямі абмену рэчываў і звязаным з імі ўзбуджэннем ц.н.с. Лячэнне хвароб, якія ўзніклі на аснове Д., па агульных правілах з улікам асаблівай схільнасці арганізма да Д. Асобную групу складае *дыятэз гемарагічны*. *Р.У.Дэрфліо.*

ДЫЯТЭ́З ГЕМАРАГІ́ЧНЫ, прыроджаныя ці набытыя хваробы крыві, асн. прыкмета якіх павышаныя крывацёк і кровазліццё. Развіццё Д.г. звязваюць з паталогіяй кампанентаў згусання крыві (плазмавых і тромбацытарных), узмацненнем фібрынолізу, наяўнасцю антыкаагулянтаў у крыві, павышэннем пранікальнасці сасудаў ці анамаліяй іх сценак. Прыкметы: кровазліццё пад скуру, у суставы, мышачныя гематомы, крывацёкі (страўнікава-кішачныя, нырачныя, са слізістых абалонак і інш.), крывацёк з пупочнай ранкі пры нараджэнні дзіяці, калі прарэзваюцца ці мяняюцца зубы, схільнасць да інфекц. хвароб. *М.З.Ягоўдзік.*

ДЫЯТЭРМАКААГУЛЯ́ЦЫЯ (ад *дыятэрмія* + *каагуляцыя*), э л е к т р а к а а г у л я ц ы я, лячэбны метад уздзеяння на жывыя тканкі з мэтай іх разбурэння, рассячэння ці выдалення пераменным эл. токам высокай частаты і вялікай сілы, што выклікае павышэнне т-ры тканкі. Крыніца эл. току — іскравыя і электралямпавыя генератары. Выкарыстоўваюць для спынення крывацёку пры аперацыях, пры новаўтварэннях, эрозіях, папіломах, запаленчых працэсах, язвах і інш.

ДЫЯТЭРМІ́Я (ад *дыя...* + грэч. thermē гарачка, цеплыня), э н д а т э р м і я, т э р м а п е н е т р а ц ы я, адзін з метадаў электралячэння, які прадугледжвае награванне органаў і тканак арганізма токам высокай частаты (1,65 Мгц) і вял. сілы (да 3А). Выкарыстоўваюць пры лячэнні хвароб, у аснове якіх спазмы крывяносных сасудаў, мачаточніка, жоўцевых праток, жоўцевага пузыра і інш. полых органаў, пры хранічных нягнойных запаленчых хваробах, запаленнях нерваў і іх карэньчыкаў, неўралгіях, сустаўных, мышачных і інш. болях.

ДЫЯФАНАСКАПІ́Я (ад грэч. diaphanēs празрысты + *...скапія*), прасвечванне прыдаткавых пазух носа, вочных яблыкаў для вызначэння іх стану. Пры паталаг. зменах (пухліна, запаленне, іншароднае цела) пашкоджаны бок зацемнены. Д. робяць у зацемненым памяшканні спец. эл. лямпачкай, замацаванай на ручцы або ў спец. метал. капсуле. Д. верхнясківічных (гаймаравых) пазух носа робяць праз рот. *А.С.Арцюшкевіч.*

ДЫЯФА́НТ А л е к с а н д р ы й с к і (Diophantos von Alexandreia; мабыць, 3 ст.), старажытнагрэчаскі матэматык. Аўтар трактата «Арыфметыка» (збераглося 6 кніг з 13) і працы пра т.зв. многавугольныя лікі (засталіся ўрыўкі). У «Арыфметыцы» даецца рашэнне задач, якія прыводзяць да т.зв. *дыяфантавых ураўненняў*. Увёў літарную сімволіку ў алгебру. Працы Д. з'явіліся зыходным пунктам для даследаванняў П.Ферма, Л.Эйлера, К.Гаўса і інш.

Тв.: Рус. пер. — Арифметика и книга о многоугольных числах. М., 1974.

Літ.: В а н - д е р - В а р д е н Б.Л. Пробуждающая наука: Пер. с гол. М., 1959.

ДЫЯФА́НТАВЫ НАБЛІЖЭ́ННІ, раздзел *лікаў тэорыі*, у якім вывучаецца рашэнне ў цэлых ліках лінейных і нелінейных няроўнасцей ці сістэм няроўнасцей з рэчаіснымі каэфіцыентамі. У прыватнасці, вывучаюцца набліжэнні рэчаісных лікаў рацыянальнымі. Названы ў гонар *Дыяфанта*.

Напр., для адвольнага рэчаіснага ліку α няроўнасць $|\alpha - p/q| < q^{-2}$ мае бясконца шмат рашэнняў у цэлых ліках p і q (ням. матэматык П.Дзірыхле), аднак няроўнасць $|\beta - p/q| < c\,(\beta)\, q^{-n}$ пры пэўным значэнні $c\,(\beta)$ не мае рашэнняў у алгебраічных ліках β ступені n (франц. матэматык Ж.Ліувіль). З апошняй тэарэмы вынікае трансцэндэнтнасць лікаў тыпу $\sum_{n=1}^{\infty} 10^{-n!}$ Д.н. маюць шмат дастасаванняў у розных раздзелах матэматыкі. Значны ўклад у развіццё Д.н. зрабілі ням. матэматык Г.Мінкоўскі, англ. матэматыкі К.Рот і А.Бейкер, сав. матэматык А.В.Гельфанд, бел. матэматык У.Г.Спрынджук.

Літ.: В и н о г р а д о в И.М. Метод тригонометрических сумм в теории чисел. 2 изд. М., 1980; Х и н ч и н А.Я. Цепные дроби. 4 изд. М., 1978. *В.І.Бернік.*

ДЫЯФА́НТАВЫ ЎРАЎНЭ́ННІ, від *алгебраічных ураўненняў* ці іх сістэм з цэлымі каэфіцыентамі, у якіх рашэнні шукаюцца ў цэлых або рацыянальных ліках. Названы ў гонар *Дыяфанта*.

Колькасць невядомых у Д.у. перавышае колькасць ураўненняў (невызначальныя ўраўненні). Д.ў. 1-й ступені $ax+by=1$ пры ўзаемна простых a і b мае бясконцае мноства рашэнняў. Д.ў. 2-й ступені таксама можа мець бясконцае мноства рашэнняў, напр., ураўненне Пеля $x^2-Ay^2=1$ ($A>0$; A — няпоўны квадрат). Агульная тэорыя Д.у. вышэйшых ступеняў адсутнічае, але даказана невырашальнасць вядомай праблемы Ферма: Д.ў. $x^n+y^n=z^n$ не мае рашэнняў у натуральных ліках x, y, z і $n>2$ (А.Вайлс, Р.Тэйлар, ЗША, 1995).

Літ.: Г е л ь ф о н д А.О. Решение уравнений в целых числах. 4 изд. М., 1983. *В.І.Бернік.*

ДЫЯФІ́ЛЬМ (ад *дыя...* + *фільм*), кароткаметражны фільм, які складаецца з

чорна-белых ці каляровых статычных дыяпазітываў на кінаплёнцы, размешчаных у пэўнай паслядоўнасці і аб'яднаных агульным сюжэтам. 50—70 кадраў. Ёсць агучаныя Д. Выкарыстоўваюцца ў навуч. працэсе, у лекцыйнай рабоце. Дэманструюць іх з дапамогай фільмаскопа ці дыяпраектара.

ДЫЯФРА́ГМА (ад *дыя...* + грэч. phragma перагародка), грудабрушная перапона, сухажыльна-мышачная перагародка, якая аддзяляе грудную поласць ад брушной у млекакормячых жывёл і чалавека. Д. наз. таксама некат. мышцы ці групы мышцаў, што абмяжоўваюць якую-н. поласць: Д. рота, утвораная сківічна-пад'язычнай мышцай, Д. таза, мочапалавая Д. і інш.

ДЫЯФРА́ГМА, дэталь машын, прылад, апаратаў, збудаванняў у выглядзе сценкі або пласціны (з адтулінай ці суцэльная). У некаторых прыладах Д. наз. *мембранай*. 1) Д. вымяральная — дыск з адтулінай; адно са стандартных звужвальных прыстасаванняў. Выкарыстоўваецца пры вымярэнні расходу вадкасцей, газаў і пары, якія працякаюць па трубаправодзе. 2) Д. канструкцыі — суцэльны або рашотчаты элемент прасторавай канструкцыі для павелічэння яе жорсткасці. Выкарыстоўваецца ў танкасценных канструкцыях, каркасна- і буйнапанэльных збудаваннях і інш. 3) Д. плаціны — проціфільтрацыйная верт. сценка ўнутры цела земляной ці каменна-накідной плаціны. Вырабляецца з бетону, жалезабетону, металу, пластмас або драўніны. 4) Д. ўоптыцы — элемент аптычнай сістэмы ў выглядзе перагародкі, якая абмяжоўвае папярочнае сячэнне светлавых пучкоў. Вызначае *апертуру*, поле зроку, глыбіню рэзка адлюстраванай прасторы і інш., уплывае на *аберацыі аптычных сістэм* і *раздзяляльную здольнасць* сістэмы. Адрозніваюць Д. апертурную (вызначае памеры светлавых пучкоў, што праходзяць праз сістэму) і палявую (памеры прасторы прадметаў, што адлюстроўваюцца сістэмай). Д. перад аб'ектывам кіна- ці фотаапарата наз. святлоахоўнай *блендай*.



Дыяфрагма ірысавая фатаграфічная: 1 — рухомае кальцо; 2 — пялёстак; 3 — вядучы штыфт; 4 — святлопранікальная адтуліна.

ДЫЯХРАНІ́Я (ад *дыя...* + грэч. chronos час), 1) змены, што адбываюцца на працягу часу ў моўнай сістэме, на асобных *узроўнях мовы*, а таксама ў іх падсістэмах і адзінках. 2) Лінгвістычнае вывучэнне працэсаў такіх змен, а таксама гіст. развіцця моўнай сістэмы ў цэлым. Дыяхранічнае мовазнаўства даследуе законы існавання і функцыянавання мовы ў часе і прасторы, што істотна для разумення як агульнай прыроды мовы, так і прычын, што абумовілі яе стан на пэўным гіст. этапе. Паслядоўнае размежаванне Д. і *сінхраніі* (а таксама самі тэрміны) прапанаваны Ф. дэ *Сасюрам*. Асн. раздзелы дыяхранічнага мовазнаўства: *параўнальна-гістарычнае мовазнаўства*, гіст. граматыка і лексікалогія, этымалогія, гісторыя літ. мовы, дыяхранічная тыпалогія моў.

Літ.: Соссюр Ф. де. Курс общей лингвистики // Соссюр Ф. де. Тр. по языкознанию: Пер. с фр. М., 1977; Пауль Г. Принципы истории языка: Пер. с нем. М., 1960.

Н.Б.Мячкоўская.

ДЫ́ЯШ, Дыяш ды Наваіш [Dias (Diaz) de Novaes] Барталамеу (каля 1450—29.5.1500), партугальскі мараплавец. У 1487 узначаліў экспедыцыю, якая шукала марскі шлях у Індыю. Даследаваў паўд.-зах. ўзбярэжжа Афрыкі паміж 22° і 33° паўд. ш. Першы з еўрапейцаў абагнуў Афрыку з Пд. Прайшоў уздоўж паўд. берага Афрыкі да бухты Алгоа, але быў вымушаны па патрабаванні каманды павярнуць у Партугалію; на зваротным шляху адкрыў мыс Добрай Надзеі (1488). У 1500 прымаў удзел у экспедыцыі П.А.Кабрала, загінуў недалёка ад мыса Добрай Надзеі.

ДЭ... (лац. de...), прыстаўка, якая абазначае: 1) аддзяленне, выдаленне, адмену, спыненне чаго-н. або адваротнае дзеянне, напр., *дэгазацыя, дэмабілізацыя*; 2) рух уніз, паніжэнне, спад, напр., *дэградацыя, дэвальвацыя*.

ДЭ́АК (Deák) Ферэнц (17.10.1803, с. Шэйцёр, медзье Зала, Венгрыя — 29.1.1876), венгерскі паліт. дзеяч. У 1833—47 адзін з лідэраў парламенцкай апазіцыі, якая падтрымлівала Л.*Кошута*. У 1848 міністр юстыцыі ва ўрадзе Л.Бацяні. Пасля паражэння рэвалюцыі 1848—49 у Венгрыі выступаў за пасіўнае супраціўленне *Габсбургам*. У 1861 лідэр парламенцкай т.зв. партыі петыцыі, якая выступала за аднаўленне рэв. законаў 1848 шляхам падачы прашэнняў Габсбургам. У 1865 заснаваў і ўзначаліў паліт. партыю (партыя Д.), якая адыграла вядучую ролю ў падрыхтоўцы і заключэнні аўстра-венг. пагаднення 1867.

ДЭА́Н (Dehaene) Жан Люк (н. 7.8.1940, г. Манпелье, Францыя), бельгійскі паліт. і дзярж. дзеяч. Юрыст і эканаміст. Член фламандскай Хрысц. нар. партыі. З 1971 працаваў у шэрагу мін-ваў. З 1979 шэф кабінета ў першым урадзе В.Мартэнса. З 1981 міністр сац. палітыкі, міністр транспарту. З 1992 прэм'ер-міністр Бельгіі. Урад Д. завяршыў пераўтварэнне Каралеўства Бельгіі ў федэратыўную дзяржаву (1993).

ДЭАНТАЛО́ГІЯ [ад грэч. deon (deontos) патрэбнае, належнае + *...логія*], раздзел этыкі, які разглядае праблемы абавязку і належнага (таго, што адлюстроўвае патрабаванні маралі ў форме прадпісанняў). Тэрмін уведзены англ. філосафам-утылітарыстам І.*Бентамам*, які ўжыў яго для абазначэння тэорыі маральнасці. З уяўлення аб належным (што «павінна быць») складваюцца маральныя патрабаванні, уяўленні пра тое, якія ўчынкі людзі павінны рабіць. У дачыненні да чалавека гэтыя патрабаванні з'яўляюцца яго *абавязкамі*, якія ў абагульненай форме правіл, што ў аднолькавай ступені датычаць усіх, фармулююцца ў маральных нормах, прадпісаннях, *запаведзях*. Усе гэтыя этычныя катэгорыі — прадмет вывучэння Д.

ДЭАНТАЛО́ГІЯ медыцынская, сукупнасць маральных норм прафесійных паводзін мед. работнікаў.

Тэрмін прапанаваў у пач. 19 ст. англ. філосаф Дж.Бентам для абазначэння тэорыі маральнасці. Асновы Д. вядомы яшчэ ў медыцыне стараж. свету. У кожную гіст. эпоху ў адпаведнасці з пануючай у грамадстве мараллю прынцыпы Д. мелі характэрныя асаблівасці, але заставаліся непарушнымі агульначалавечыя, пазакласавыя этычныя нормы мед. прафесіі — аблягчыць пакуты і дапамагчы хвораму чалавеку. Асабліва важная роля ў вызначэнні маральных пачаткаў мед. дзейнасці належыць Гіпакрату. Дэанталагічныя прынцыпы, выказаныя ў яго «Клятве», актуальныя і цяпер.

Д. фарміруе прынцыпы паводзін мед. персаналу, накіраваныя на стварэнне максімальна спрыяльных умоў для эфектыўнага лячэння хворых. Яна ўключае ў сябе розныя аспекты працы ўрача — ад этычных, маральных прынцыпаў да прававых пытанняў у канфліктных сітуацыях. У сферу Д. ўваходзяць пытанні, звязаныя з лячэбнай тактыкай, узаемаадносінамі ўрача з хворым, яго сваякамі, з паняццем урачэбнай тайны, калегіяльнасцю, памылкамі і адказнасцю ўрачоў, паводзінамі ўрача ў быце і інш. Д. стала абавязковай састаўной часткай падрыхтоўкі і выхавання мед. персаналу.

ДЭАЭРА́ТАР (ад *дэ...* + грэч. aēr паветра), апарат для выдалення з вады раствораных у ёй газаў (пераважна кіслароду і дыаксіду вугляроду). Звычайна ўстанаўліваюцца на цеплавых і атамных электрастанцыях для дэаэрацыі вады, якая падаецца ў парагенератары і цеплавую сетку, з мэтай недапушчэння карозіі тэхнал. абсталявання. Бываюць тэрмічныя (газы выдаляюцца падагрэвам вады), хім. (з сульфітам натрыю), сталястружачныя (кісларод паглынаецца пры акісленні металу). У струменных тэрмічных Д. вада падаецца ў верхнюю яго частку, дзе распырскваецца, сцякае ўніз і награецца сустрэчнай парай да кіпення; газы і лішкі пары (выпар) выдаляюцца ў атмасферу.



Схема струменнага дэаэратара.

ДЭБА́ЕЎСКІ РА́ДЫУС ЭКРАНАВА́ННЯ, адлегласць, на якую распаўсюджваецца дзеянне электрастатычнага поля асобнай зараджанай часціцы ў праводзячым асяроддзі (растворы моцных электралітаў, плазма, цвёрдыя праваднікі). Уведзены П.*Дэбаем* пры даследаванні электролізу.

Д.р.э. залежыць ад уласцівасцей асяроддзя: канцэнтрацыі і абс. значэння зараду часціц, энергіі іх цеплавога руху (г.зн. ад т-ры). Калі крыніца эл. поля (зараджаная часціца) знаходзіцца ў асяроддзі, якое мае дадатныя і адмоўныя зарады, то з прычыны палярызацыі асяроддзя эл. поле крыніцы робіцца вельмі малым (экрануецца) на адлегласцях, большых за Д.р.э. Ён роўны каля 10^{-8} см у металах, каля 10^{-4} см у паўправадніках пры хатняй т-ры.

ДЭБА́Й (Debye) Петэр Іозеф Вільгельм (24.3.1884, г. Маастрыхт, Нідэрланды —

П.Дэбай.

2.11.1966), галандскі фізік і хімік, адзін са стваральнікаў тэорыі цвёрдага цела. Замежны чл. АН СССР (1924) і інш. акадэмій. Скончыў Мюнхенскі ун-т (1910). З 1911 праф. ун-таў Швейцарыі і Германіі, у 1934—39 дырэктар Ін-та фізікі кайзера Вільгельма (Берлін), у 1940—50 праф. Корнелскага ун-та (ЗША). Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела, тэорыі будовы малекул і квантавай тэорыі атама. Пабудаваў мадэль цвёрдага цела (1912), устанавіў залежнасць цеплаёмістасці крышталёў ад т-ры (гл. *Дэбая закон*). Распрацаваў дыпольную тэорыю дыэлектрыкаў, прапанаваў рэнтгенаўскі метад даследавання дробнакрышт. матэрыялаў (гл. *Дэбая—Шэрэра метад*). Нобелеўская прэмія 1936.

Літ.: Гельфер Я.М. История и методология термодинамики и статистической физики. 2 изд. М., 1981. С. 486—491.

А.І.Болсун.

ДЭБА́Й, пазасістэмная адзінка эл. *дыпольнага моманту* малекул. Абазначаецца Д. Названа ў гонар П.*Дэбая*. 1 Д = =3,33564 · 10^{-30} Кл · м.

ДЭБАРКАДЭ́Р (франц. débarcadère ад débarquer выгружаць, высаджваць на бераг), 1) плывучае несамаходнае збудаванне (найчасцей *пантон* з двух- ці трохпавярховай надбудовай) для прычальвання, стаянкі і адпраўлення рачных суднаў. Бываюць пасажырскія (маюць памяшканні для адпачынку і абслугоўвання пасажыраў), грузавыя (маюць механізмы для пагрузачна-разгрузачных работ, склады). Д. ўстанаўліваюць каля берага, дзе няма спец. абсталяванай прыстані; замацоўваюць тросамі. Даўж. 40—100 м. 2) Устаралая назва чыг. станцыйнай платформы.

ДЭБА́ТЫ (франц. débats ад debattre спрачацца), абмеркаванне якога-н. пытання, абмен думкамі на сходзе, пасяджэнні; спрэчкі.

ДЭБА́Я ЗАКО́Н, палажэнне, паводле якога цеплаёмістасць Cv крышт. рашоткі аднаатамных цвёрдых цел пры нізкіх тэмпературах прапарцыянальная кубу абсалютнай тэмпературы T. Выведзены П.*Дэбаем*. Д.з. мае выгляд $Cv=77{,}94 \times \times 3R(\frac{T}{\theta})^3$, дзе R — універсальная газавая пастаянная, θ — т-ра Дэбая, што вызначае тэмпературную мяжу, ніжэй якой становяцца істотнымі квантавыя эфекты.

Літ.: Федоров Ф.И. Теория упругих волн в кристаллах. М., 1965. С. 352—366.

ДЭБА́Я—ШЭ́РЭРА МЕ́ТАД, метад даследаванняў полікрышталічных матэрыялаў з дапамогай *дыфракцыі рэнтгенаўскіх прамянёў*. Прапанаваны П.*Дэбаем* і швейц. фізікам П.Шэрэрам (1916). Выкарыстоўваецца ў рэнтгенаўскім структурным аналізе для вымярэнняў параметраў элементарнай ячэйкі крышталёў, фазавага аналізу полікрышт. матэрыялаў і інш.

У Д.—Ш.м. тонкі пучок монахраматычных рэнтгенаўскіх прамянёў накіроўваецца на ўзор, які рассейвае выпрамяненне ўздоўж утваральных сувосевых конусаў (рассеянне адбываецца на крышталіках, для якіх выконваецца *Брэга—Вульфа ўмова*). Пры раўнамерным вярчэнні ўзору вакол восі, перпендыкулярнай першаснаму пучку выпрамянення, усе крышталікі ўводзяцца ў адбівальнае становішча. Рассеянае выпрамяненне рэгіструецца на фотаплёнцы ў цыліндрычнай (дэбаеўскай) рэнтгенаўскай камеры або з дапамогай рэнтгенаўскага дыфрактометра. *М.М.Аляхновіч.*

ДЭ́БЕТ (ад лац. debet ён павінен), частка *бухгалтарскага ўліку*. У актыўных рахунках па Д. запісваецца павелічэнне, а ў пасіўных — змяншэнне аб'ектаў уліку. У разліковых рахунках па Д. адлюстроўваецца запазычанасць юрыд. і фіз. асоб дадзенаму прадпрыемству — т.зв. дэбіторская запазычанасць.

ДЭ́БЕЦ Георгій Францавіч (7.12.1905, г. Томск, Расія — 19.1.1969), рускі антраполаг. Д-р біял. н. (1941), праф. (1944). Скончыў Іркуцкі ін-т (1925). З 1927 у Ін-це антрапалогіі пры Маскоўскім ун-це, з 1945 у Ін-це этнаграфіі АН СССР. Даследаваў пытанні расазнаўства, этнічнай антрапалогіі і антрапалагічнага складу народаў СССР і Афганістана, палеаантрапалогіі і антрапагенезу. Сабраў і даследаваў у этнагенетычным плане матэрыял пра стараж. насельніцтва на тэр. СССР. Упершыню даследаваў у этнагістарычным плане краніялагічны матэрыял аб насельніцтве Беларусі 10—13 ст. Распрацоўваў методыку антрапалагічных даследаванняў.

Тв.: Чарапы Люцынскага могільніка і старажытных славян Беларусі і месца апошніх у палеаантрапалогіі Усходняй Еўропы // Працы секцыі археалогіі Ін-та гісторыі БАН. Мн., 1932. Т. 3; Палеоантропология СССР. М.;Л., 1948.

ДЭБІДУ́Р (Debidour) Антанен (31.1.1847, г. Нантрон, Францыя — 21.2.1917), французскі гісторык. Кіраваў кафедрамі геаграфіі (з 1879), гісторыі (з 1880), ун-та ў г. Нансі. З 1891 гал. інспектар нар. адукацыі ў Францыі. З 1906 у Парыжскім ун-це (Сарбоне), кіраўнік кафедры гісторыі хрысціянства новага часу. Аўтар прац «Дыпламатычная гісторыя Еўропы ад Венскага да Берлінскага кангрэса (1814—1878)» (т. 1—2, 1891), «Каталіцкая царква і дзяржава ў час Трэцяй рэспублікі (1870—1906)» (т. 1—2, 1906—09) і інш.



Схема здымка рэнтгенаграмы паводле Дэбая—Шэрэра метаду: 1 — рэнтгенаўская трубка; 2 — монахраматычнае рэнтгенаўскае выпрамяненне; 3 — дыяфрагма; 4 — крышталь; 5 — фотаплёнка; 6 — след дыфрагаваных прамянёў; O — след прамянёў, што прайшлі крышталь навылёт.

Тв.: Рус. пер. — Дипломатическая история Европы, 1814—1878. Т. 1—2. Ростов н/Д., 1995.

ДЭБІ́ЛЬНАСЦЬ (ад лац. debilis слабы, няздольны), лёгкая ступень *алігафрэніі*, характарызуецца прымітыўнасцю суджэнняў і вывадаў, недастатковай дыферэнцыяцыяй эмоцый, абмежаванасцю навучання, зніжанай сац. адаптацыяй.

ДЭБІ́Т (ад франц. débit збыт, расход), колькасць вадкасці (вады, нафты) або газу, якія паступаюць за адзінку часу з прыроднай ці штучнай крыніцы (буравой свідравіны, калодзежа, водазабornага збудавання, трубы і інш.). Д. вадкасці вымяраецца ў л/с, м^3/с, м^3/сут (для нафты і т/сут); газу — у м^3/сут.

Д. вызначаецца разлікам (па формулах падземнай гідрадынамікі) і з дапамогай адпампоўвання (пробных, доследных, эксплуатацыйных). Пры адпампоўваннях для вымярэння Д. вадкасці выкарыстоўваюць мерныя пасудзіны, вадамеры, дэбітометры, самапісныя дэбітографы, свідравінныя расхадамеры; газу — анемометры, шайбавыя вымяральнікі і інш. Д. водазаборных свідравін на Беларусі ад 0,005 да 0,05 м^3/с. *П.М.Багаслаўчык.*

ДЭБІТО́Р (ад лац. debitor даўжнік), у цывільным праве бок у абавязацельстве, які павінен выканаць пэўныя дзеянні або ўстрымацца ад выканання дзеяння; даўжнік. У якасці Д. могуць выступаць толькі асобы, здольныя быць носьбітамі грамадзянскіх правоў і абавязкаў, у т.л. юрыд. асобы.

ДЭБІТО́РСКАЯ ЗАПАЗЫ́ЧАНАСЦЬ, сума даўгоў, належных прадпрыемству і арганізацыі або ўстанове ад юрыд. або фіз. асоб па выніках гасп. узаемаадносін з імі.

ДЭ́БІШ Анатоль Іосіфавіч (н. 22.7.1962, в. Шамятоўка Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. паэт. Брат В.*Дэбіша*. Скончыў Мінскі ін-т культуры (1987). Працуе дырэктарам Дома культуры ў Брэсце. Друкуецца з 1983. Аўтар зб. вершаў «Калядная вячэра» (1992), «Стодзівы» (1995). Тэматычны дыяпазон паэзіі Д. разнастайны — ад часоў паганства («Зніч», «Мара», «Чарнабог», «Пераплут», «Дзіў», «Велямос») да нашых дзён. Грунтуючыся на бел. нар. міфалогіі і фальклоры, аўтар асэнсоўвае стараж. светаўспрыманне, светабачанне і светаразуменне нашых далёкіх продкаў, яднае язычніцкія ўяўленні і хрысціянскія ідэалы, пяе хваласпеў жанчыне, каханню. Развівае жанры санета, балады, трыялета, элегіі, паэт. форму тэрцыны. *І.У.Саламевіч.*

ДЭ́БІШ Васіль Іосіфавіч (н. 22.7.1962, в. Шамятоўка Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. паэт. Брат А.*Дэбіша*. Скончыў Мінскі ін-т культуры (1987). Працуе ў Брэсце. Друкуецца з 1987. Аўтар зб. вершаў «Белыя птахі» (1992), «Лісты да Марыі» (1996). У лірыцы Д. — рамант. свет чалавека, любоўныя перажыванні героя («Ліст да Марыі», «След ваших губ на крышталі», «Любіў. Ды ты не зразумела»), асэнсаванне духоўных крыніц жыцця народа, роднай гісторыі («Вільня», «Багрымава жалейка», «Апошняя ноч К.Каліноўскага»). Звяртаецца і да нац. міфалогіі. Распрацоўвае жанры трыялета, квантэмы. *І.У.Саламевіч.*

ДЭБО́РА, Д э в о р а, паводле Бібліі, яўрэйская прарочыца і суддзя, якая аб'яднала стараж.-яўр. плямёны і ўзначаліла заваяванне імі Палесціны. У аснове падання гіст. факт бітвы аб'яднанага войска ізраільскіх плямён з войскам ханаанейскіх цароў. Подзвігам удзельнікаў бітвы і перамозе над ворагам прысвечана «Песня Дэборы» — стараж. помнік яўр. л-ры (каля 1200 да н.э.).

А.М.**Дэборын**.

Дж.**Дэбро**.

К.**Дэбюсі**.

ДЭБО́РЫН (І о ф е) Абрам Майсеевіч (16.6.1881, мяст. Упіна Шылальскага р-на, Літва — 8.3.1963), расійскі філосаф, гісторык. Акад. АН СССР (1929). Скончыў Бернскі ун-т (1908). Даследаваў гісторыю і тэорыю марксізму, дыялектыку, філас. пытанні прыродазнаўства, гісторыю сац.-паліт. вучэнняў у Еўропе. Лічыў, што дыялектыка ўнутрана ўласціва прыродным і гіст. з'явам, а дыялект. метад падлягае ўкараненню ў прыродазнаўства, сама марксісцкая філасофія па спосабах развіцця свайго зместу з'яўляецца дэдуктыўнай навукай. Адзін з ініцыятараў выдання на рус. мове збору твораў Г.Гегеля (гал. рэдактар 1-га тома).

Тв.: Людвиг Фейербах: Личность и мировоззрение. М., 1923; Диалектика и естествознание. 4 изд. М.; Л., 1930; Введение в философию диалектического материализма. 6 изд. М.; Л., 1931; Социально-политические учения нового и новейшего времени. Т. 1—2. М., 1958—67. *Т.І.Адула.*

ДЭБРО́ (Debreu) Джэрард (н. 4.7.1921, г. Кале, Францыя), франка-амерыканскі эканаміст. Вучыўся ва ун-тах Францыі, ЗША, Скандынавіі. Д-р эканам. н. (1956). Быў супрацоўнікам Нац. цэнтра навук. даследаванняў, Камісіі Коўлса па эканам. даследаваннях пры Чыкагскім ун-це, з 1962 праф. эканомікі і матэматыкі Каліфарнійскага ун-та ў Берклі. Даследаванні ў галіне эканаметрыі (вывучэнне канкрэтных колькасных узаемасувязей эканам. аб'ектаў і працэсаў з дапамогай матэм. і статыст. метадаў і мадэлей), тэорыі агульнага эканам. развіцця (*гранічнай карыснасці тэорыя, эканамічнай раўнавагі тэорыя*). Нобелеўская прэмія 1983.

ДЭ БРО́ЙЛЯ ХВА́ЛІ, гл. *Хвалі дэ Бройля*.

ДЭ́БРЭЦЭН (Debrecen), горад на У Венгрыі. Адм. ц. медзьве Хайду-Біхар. Вядомы з 10 ст. 217,7 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Важны эканам. і культ. цэнтр. Прам-сць: маш.-буд. (вагонабудаванне, вытв-сць падшыпнікаў, мед. абсталявання, с.-г. машын), хімічна-фармацэўтычная, швейная, мэблевая, гарбарна-абутковая, тытунёвая, харчасмакавая. 3 ун-ты. Ін-ты атамных даследаванняў і фізікі Сонца АН Венгрыі. Музеі. Арх. помнікі 18—19 ст. Бальнеалагічны курорт. У Д. ў 1849 Л.*Кошут* абвясціў незалежнасць Венгрыі.

ДЭБЮРО́ (Deburau) Жан Батыст Гаспар (31.7.1796, г. Колін, Чэхія — 17.6.1846), французскі акцёр-мім. З сям'і вандроўных акцёраў-акрабатаў. З 1816 у трупе т-ра «Фюнамбюль» («Канатныя танцоры»). Стварыў у розных пантамімах вобраз П'еро, які стаў папулярным нар. камічным героем і атрымаў сусв. вядомасць. Захаваўшы старадаўні фарсавы грым П'еро, Д. змяніў яго аблічча і касцюм. У сучаснай пантаміме традыцыі Д. знайшлі працяг у творчасці Ж.Л.*Баро* і М.*Марсо*.

ДЭБЮСІ́ (Debussy) Клод Ашыль (22.8.1862, Сен-Жэрмен-ан-Ле, каля Парыжа — 25.3.1918), французскі кампазітар, піяніст, дырыжор, муз. крытык; пачынальнік муз. *імпрэсіянізму*. Скончыў Парыжскую кансерваторыю па класах фп. і кампазіцыі (1884). За кантату «Блудны сын» атрымаў Рымскую прэмію. Выступаў як дырыжор, піяніст (пераважна з выкананнем уласных твораў) і муз. крытык. Наведваў Расію (1880, 1881, 1913). У сваёй творчасці арыентаваўся на франц. муз. традыцыі (Ф.Куперэна, Ф.Рамо, Ш.Гуно, Ж.Маснэ), зазнаў уплыў рус. музыкі (асабліва М.Мусаргскага). Блізкасць да мастакоў-імпрэсіяністаў і да гуртка паэта-сімвалiста С.Малармэ, (канец 1880-х г.) паскорыла фарміраванне яго эстэт. прынцыпаў. Маніфестам муз. імпрэсіянізму стала аркестравая «Прэлюдыя да «Пасляпаўдзённага адпачынку фаўна» (1894), у якой выявіліся характэрныя для музыкі Д. хісткасць настрояў, вытанчанасць, капрызнасць мелодыкі, ка-

ларыстычнасць гармоніі. Адно з найб. значных тварэнняў Д. — опера «Пелеас і Мелізанда» (паводле М.Метэрлінка; 1902), дзе дасягнута поўнае зліццё музыкі з дзеяннем. Бляскам і празрыстасцю аркестравай палітры адзначаны найб. буйны яго твор — 3 сімф. эскізы «Мора» (1905). Імкнучыся да пастаяннага мігцення фарбаў, ён выкарыстоўваў натуральныя лады, пентатоніку, цэлатонавасць; ускладняючы гарманічныя сродкі, дасягаў разнастайных сумяшчэнняў гармоній, элементаў політанальнасці. У некат. творах («Бергамаская сюіта» для фп., 1910; музыка да містэрыі Г.Д'Анунцыо «Пакуты св. Себасцьяна», 1911; балет «Гульні», 1912, і інш.) выявіліся рысы, пазней уласцівыя неакласіцызму. Д. стварыў новы піяністычны стыль. Яго 24 прэлюдыі для фп. (1910—13) малююць вобразы мяккіх, часам нерэальных пейзажаў, імітуюць пластыку танц. рухаў, навяваюць паэт. прывіды, жанравыя карціны. Наватарская творчасць Д. істотна паўплывала на сусв. музыку 20 ст.

Літ. тв.: Рус. пер. — Статьи, рецензии, беседы. М.;Л., 1964; Избр. письма. Л., 1986.

Літ.: Сабинина М. Дебюсси // Музыка XX в. М., 1977. Ч. 1, кн. 2; Яроциньский С. Дебюсси, импрессионизм и символизм: Пер. с пол. М., 1978; Дебюсси и музыка XX в.: Сб. ст. Л., 1983.

ДЭБЮ́Т (франц. début літар. пачатак), 1) першае выступленне на якім-н. полі дзейнасці (напр., артыста на сцэне). 2) Пачатковая стадыя шахматнай, шашачнай партыі. У значэнні Д. ужываюцца тэрміны «абарона», «партыя», «гамбіт» і інш.

ДЭ ВАЛЕ́РА (De Valera) Іман (14.10.1882, Нью-Йорк — 29.8.1975), дзяржаўны і паліт. дзеяч Ірландыі. Скончыў Дублінскі ун-т (1904). З 1908 чл. *Гэльскай лігі*, з 1913 — патрыят. арг-цыі «Ірл. валанцёры». Адзін з кіраўнікоў *Ірландскага паўстання 1916*, за што зняволены і прыгавораны да смерці, але амністыраваны. З 1917 лідэр паліт. арг-цыі *Шын фейн* і «Ірл. валанцёраў». У 1919 абраны прэзідэнтам Ірл. рэспублікі, не прызнаў англа-ірландскі дагавор 1921. У 1922 адмовіўся ад пасады прэзідэнта і ў грамадз. вайну 1922—23 узначаліў апазіцыю, якая дамагалася поўнага суверэнітэту і цэласнасці краіны. У 1923 заснаваў партыю «Фіяна файл», пасля яе перамогі на выбарах узначальваў у 1932—48 урад і быў міністрам замежных спраў. Імкнуўся да поўнай паліт. і эканам. незалежнасці Ірландыі ад Вялікабрытаніі. У 1932 узначальваў сесію Савета Лігі Нацый, у 1938 — Асамблею Лігі Нацый. У 2-ю сусв. вайну захаваў нейтралітэт Ірландыі. У 1951—54, 1957—59 зноў кіраўнік урада, у 1959—73 прэзідэнт Ірландыі.

ДЭВАЛЬВА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *вальвацыя*), зніжэнне курсу валюты адной краіны ў адносінах да курсу валюты іншай краіны або шэрагу дзяржаў. Д. звычайна праводзіцца ва ўмовах вял. дэфіцыту плацежнага балансу, уцечкі золата і замежнай валюты з краіны, міграцыі капіталаў у інш. краіны з-за росту працэнтных ставак, а таксама з мэтай стымулявання экспарту.

ДЭ́ВАН (Devon), востраў у Канадскім Арктычным архіпелагу, тэр. Канады. Пл. 54 тыс. км². На У крышт. масіў, выш. да 1887 м, укрыты ледавікамі. Цэнтр. ч. — вапняковае плато, выш. 250—600 м. На ПнЗ — сярэднягор'е, выш. 360—540 м. Берагі парэзаны залівамі і фіёрдамі. Месцамі расліннасць арктычнай тундры.

ДЭВАСТА́ЦЫЯ (ад лац. devastatio спусташэнне, знішчэнне), комплекс лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў па знішчэнні патагенных узбуджальнікаў інвазійных і інфекц. хвароб на ўсіх стадыях развіцця ў чалавека, жывёл і раслін. Ужываюцца метады мех., хім., фіз. і біял. ўздзеяння. Уключае *дэгельмінтызацыю, дэзінвазію, дэзінсекцыю, дэзінфекцыю, хіміятэрапію*, фагатэрапію і інш.

ДЭ́ВІ (Davy) Гемфры (17.12.1778, г. Пензанс, Вялікабрытанія — 29.5.1829), англійскі хімік і фізік, адзін з заснавальнікаў электрахіміі. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1803), яго прэзідэнт (1820—27). З 1802 праф. Каралеўскага ін-та ў Лондане. Навук. працы па неарган. хіміі, электрахіміі, па высвятленні прыроды эл. і цеплавых з'яў. Адкрыў абязбольвальнае ўздзеянне закісу азоту (1799), хім. элемент бор (1808) незалежна ад Ж.Л.Гей-Люсака. Атрымаў электролізам солей і шчолачаў калій, натрый, кальцый, стронцый, барый, магній. Прапанаваў вадародную тэорыю кіслот (1815). Апісаў эл. дугу (1808—09), устанавіў залежнасць эл. супраціўлення правадніка ад яго папярочнага сячэння і даўжыні (1821). Сканструяваў бяспечную рудніковую лямпу (1815).

Літ.: Манолов К. Великие химики: Пер. с болг. 3 изд. Т. 1. М., 1986.

ДЭВІ́З (франц. devise), 1) першапачаткова — надпіс ці эмблема на гербе, шчыце; кароткае выслоўе, якое выражае асн. ідэю паводзін або дзейнасці. 2) Слова або выслоўе, якое на конкурсах аўтар ставіць на творы замест свайго імя.

ДЭВІ́ЗНАЯ ПАЛІ́ТЫКА, адзін з асноўных (з *дысконтнай палітыкай*) метадаў уздзеяння дзяржавы на рух курсу нац. валюты шляхам куплі-продажу замежнай валюты. З мэтай павышэння курсу сваёй валюты цэнтр. банк прадае замежную валюту за нацыянальную, штучна павялічваючы попыт на яе на валютных рынках. Купля *дэвізаў* павялічвае прапанову нац. валюты і зніжае яе курс. Умова правядзення Д.п. — наяўнасць у краіне буйных *валютных рэзерваў*. Гл. таксама *Валютная палітыка*.

ДЭВІ́ЗЫ (франц. devises), плацежныя сродкі ў замежнай валюце, якія выкарыстоўваюцца ў міжнар. разліках. Першапачаткова Д. пераважалі ў выглядзе камерцыйных пераводных *вэксаляў* (трат), выпісаных экспарцёрам на імпарцёра. З пашырэннем сусв. гандлю і карэспандэнцкіх сувязей банкаў набылі форму банкаўскіх плацежных сродкаў: вэксаляў, *чэкаў, акрэдытываў*, плацежных даручэнняў, а таксама ўзаемных міждзярж. кароткатэрміновых крэдытаў. Паняцце Д. ўзнікла пасля 1-й сусв. вайны 1914—18, калі залаты манаметалізм быў заменены золатадэвізным стандартам, заснаваным на золаце і вядучых валютах зах. краін (долар ЗША, фунт стэрлінгаў, франц. франк). Цана Д. ў нац. валюце вызначаецца *валютным курсам* (гл. таксама *Дэвізная палітыка*).

Г.Дэві.

К.Дэвісан.

ДЭ́ВІСАН (Davisson) Клінтан Джозеф (22.10.1881, г. Блумінгтан, штат Ілінойс, ЗША — 1.2.1958), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН ЗША. Скончыў Чыкагскі (1908) і Прынстанскі (1911) ун-ты. З 1911 у Тэхнал. ін-це Карнегі, з 1917 у Лабараторыях Бэл-Тэлефон, у 1946—54 візіт-праф. Віргінскага ун-та. Навук. працы па электроніцы, цеплавым выпрамяненні, фізіцы крышталёў і квантавай фізіцы. Незалежна ад Дж.П.Томсана адкрыў разам з амер. фізікам Л.Джэрмерам (1927) дыфракцыю электронаў на крышталях нікелю, што стала эксперыментальным пацвярджэннем хвалевых уласцівасцей мікрааб'ектаў. Нобелеўская прэмія 1937.

Літ.: Льоцци М. История физики: Пер. с итал. М., 1970. С. 403—404.

ДЭ́ВІТ (Davitt) Майкл (25.3.1846, Стрэйд, каля г. Белфаст, Вялікабрытанія — 31.5.1906), дзеяч ірландскага нац.-вызв. руху. З 1865 удзельнік руху *феніяў*, у 1870—77 зняволены. Адмовіўшыся ад тэрарыст. тактыкі феніяў, выступаў за спалучэнне масавага руху за аграрныя пераўтварэнні з парламенцкай барацьбой за нац. вызваленне. У 1879 разам з Ч.С.Парнелам заснаваў *Зямельную лігу*. У 1890 парваў з лідэрамі руху за *Гомруль*. З 1895 чл. парламента, у 1899 у знак пратэсту супраць *англа-бурскай вайны 1899—1902* склаў з сябе парламенцкія паўнамоцтвы. Удзельнік к-та рабочага прадстаўніцтва (засн. ў 1900, з 1906 Лейбарысцкая партыя).

ДЭВІ́ЯНТНЫЯ ПАВО́ДЗІНЫ, паводзіны з адхіленнем ад агульнапрынятых у грамадстве прававых і маральна-этыч-

ных норм. Асн. іх віды: злачыннасць, алкагалізм, наркаманія, прастытуцыя, самазабойствы, сексуальная разбэшчанасць. Узнікненне Д.п. абумоўлена недахопамі выхавання, дэфектамі маральнай і прававой свядомасці, нізкім узроўнем інтэлектуальнага развіцця асобы, неспрыяльным уплывам спадчыннасці, асаблівасцямі характару, інтарэсаў і патрэбнасцей чалавека, яго эмацыянальна-валявой дзейнасці і інш. фактарамі. Італьян. псіхіятар Ч.*Ламброза* лічыў «крымінальны тып» своеасаблівым «вынікам» дэградацыі на больш ранніх стадыях чалавечай эвалюцыі. Франц. сацыёлаг Э.*Дзюркгейм* і прыхільнікі яго канцэпцыі сцвярджалі, што распаўсюджванню Д.п. садзейнічаюць сац.-эканам. і паліт. нестабільнасць, рэзкія змены ў грамадскім жыцці, сац. канфлікты, стрэсы і інш. Паводле тэорый *анамій і сацыялізацыі*, праявы Д.п. узрастаюць, калі сацыяльна дапушчальныя сродкі дасягнення грамадскіх і індывід. мэт выконваюцца не ўсімі людзьмі або калі іх уваходжанне ў сац. жыццё адбываецца ў абставінах цярпімых адносін грамадства да амаральных учынкаў, насілля. У 1960-я г. атрымала пашырэнне канцэпцыя стыгматызацыі, паводле якой Д.п. — заканамерны вынік своеасаблівага «наклейвання» на чалавека ярлыкоў накшталт «алкаголік», «наркаман», «прастытутка» і імкнення сацыяльна ізаляваць, прыцягнуць да адказнасці, выправіць ці вылечыць такіх людзей. Існуюць канцэпцыі, у якіх сцвярджаецца, што Д.п. абумоўлены асаблівасцямі будовы чалавечага цела, анамаліямі палавых храмасом.

Э.С.Дубянецкі.

ДЭВІЯ́ЦЫЯ (ад позналац. deviatio адхіленне), 1) адхіленне рухомых цел (карабля, самалёта, снарада, кулі і інш.) ад зададзенага (вызначанага) напрамку руху (разліковай траекторыі). Напр., Д. снарада, кулі выклікаецца мех. парушэннямі руху ў канале ствала (зрыванне снарада з нарэзкі) ці ў паветры (няспраўнасць апярэння стабілізатара, выпадковыя рэзкія змены кліматычных умоў у час палёту, гл. таксама *Дэрывацыя*). 2) Адхіленне рухомай сістэмы компаса ад напрамку на магн. (у магн. компаса) ці геагр. (у гіракомпаса) полюс Зямлі. Узнікае пад уплывам магн. і эл. палёў, паскоранага руху, гайданкі і інш. Кампенсуецца з дапамогай адпаведна дадатковых магнітаў ці карэктараў. 3) Адхіленне частаты ваганняў ад сярэдняга значэння (найб. пры частотнай мадуляцыі). Уплывае на склад і значэнні амплітуд складальных спектра частотна мадуляваных ваганняў, перашкодаўстойлівасць радыёсістэм і інш. 4) У б і я л о г і і — эвалюцыйнае адхіленне ў развіцці органа на сярэдніх этапах яго фарміравання (у час эмбрыянальнага развіцця); разнавіднасць *філэмбрыягенезу*. Прыводзіць да змены будовы гэтага органа ў дарослага арганізма ў параўнанні з продкамі. Напр., эпідэрмальная частка зачаткаў лускі ў паўзуноў на сярэдніх стадыях яе развіцця падвяргаецца арагавенню, а не акасцяненню, як у акул. У раслін прыклад Д. — клубні і цыбуліны, якія сфарміраваліся з першаснай эмбрыянальнай расліннай пупышкі. Тэрмін увёў ням. вучоны Ф.Мюлер (1864).

ДЭВО́ЙНА Аляксандр Мікалаевіч (н. 15.8.1933, Мінск), бел. вучоны ў галіне ядз. энергетыкі і радыяцыйнай бяспекі. Д-р тэхн. н. (1988), праф. (1994). Скончыў БПІ (1955). З 1957 у Ін-це цепла- і масаабмену. З 1965 у Ін-це ядз. энергетыкі АН Беларусі, з 1990 у Ін-це радыяцыйнай бяспекі (з 1996 нам. дырэктара). Навук. працы па фізіцы цеплавых працэсаў у ядз. энергет. установах (ЯЭУ), па стварэнні і эксплуатацыі сістэмы радыяцыйнага маніторынгу. Эксперыментальна ўстанавіў заканамернасці нестацыянарных цеплавых працэсаў пры аварыйных рэжымах ЯЭУ.

Тв.: Теплообмен при охлаждении диссоциирующих теплоносителей АЭС. Мн., 1978; Некоторые закономерности процесса вскипания диссоциирующего теплоносителя N_2O_4 в большом объеме при разгерметизации сосуда под давлением (разам з У.С.Высоцкім) // Весці АН БССР. Сер. фіз.-энергет. навук. 1985. № 3.

А.І.Болсун.

ДЭВО́НСКАЯ СІСТЭ́МА (ПЕРЫЯД), д э в о н , чацвёртая сістэма *палеазойскай эратэмы* (*групы*), якая аднавядае чацвёртаму перыяду палеазойскай эры геал. гісторыі Зямлі. Падсцілаецца адкладамі *сілурыйскай сістэмы* (*перыяду*), перакрываецца адкладамі *каменнавугальнай сістэмы* (*перыяду*). Пачалася каля 400 млн. гадоў назад, доўжылася больш за 50 млн. гадоў. Тэрмін уведзены англ. даследчыкамі Р.І.Мурчысанам і А.Седжвікам (1839). Падзяляецца на 3 аддзелы (эпохі) — ніжні, сярэдні, верхні (ранняя, сярэдняя, позняя эпохі) і 7 ярусаў (вякоў) — лохкаўскі, пражскі, эмскі (ніжні аддзел); эйфельскі, жывецкі (сярэдні); франскі, фаменскі (верхні аддзел). На Беларусі гэты падзел пакладзены ў аснову рэгіянальнай стратыграфічнай схемы (1981, 1990) дэвонскіх адкладаў. На падставе характэрных комплексаў выкапнёвых брахіёпод, астракод, канадонтаў і рэшткаў раслін (спораў) вылучаны больш дробныя адзінкі — рэгіянальныя гарызонты: баршчоўскі, чарткоўскі, віцебскі, адроўскі, асвейскі, гарадоцкі, касцюковіцкі, полацкі (старажскольскі), ланскі, саргаеўскі, сямілуцкі, рэчыцкі, варонежскі, яўланаўскі, лівенскі, даманавіцкі, задонскі, ялецкі, петрыкаўскі, лебядзянскі, арэскі, стрэшынскі, палескі.

Арганічны свет Д.с. быў багаты і разнастайны. Марскія басейны насялялі амаль усе тыпы марскіх беспазваночных жывёл (прасцейшыя, кішачнаполасцевыя, плечаногія, членістаногія, малюскі, канадонтаносьбіты і інш.), з раслін — водарасці; у лагунах, азёрах і рэках панавалі бяссківічныя і рыбы. На сушы былі пашыраны прымітыўныя расліны — псілафіты, з'явіліся папарацепадобныя, дзеразовыя і хвашчовыя, першыя голанасенныя. Некат. групы жывёл (каралы, страматапоры і інш.) і раслін (вапняковыя водарасці) адыгрывалі важную ролю ва ўтварэнні адкладаў, месцамі ў морах стваралі *арганагенныя пабудовы* (біястромы, біятермы, рыфы). Найб. важныя для расчлянення дэвонскіх адкладаў групы фауны — ганіятыты, каралы, брахіяподы, малюскі, астракоды, канадонты, рыбы; флоры — рэшткі раслін (споры).

Адклады Д.с. вядомы на ўсіх кантынентах, удзельнічаюць у будове платформеннага чахла большасці платформ Паўн. і Паўд. паўшар'яў, выходзяць на паверхню на ўсіх мацерыках. Пашыраны таксама ў складкавых сістэмах Урала, Паміра, Апалачаў, Кардыльераў і інш. Большая ч. сушы ў дэвоне была ўкрыта морамі, дзе пераважна намнажаліся тэрыгенныя і карбанатныя асадкі, у лагунах — каменныя солі, гіпсы, ангідрыты. У дэвоне пачалася *герцынская складкавасць*, якая суправаджалася актыўнай вулканічнай дзейнасцю і ўтварэннем магутных тоўшчаў вулканагенных парод. На ўсіх кантынентах з адкладамі дэвону звязаны радовішчы карысных выкапняў.

На Беларусі адклады Д.с. пашыраны на б. ч. (каля 60%) тэр. і прадстаўлены ўтварэннямі ўсіх ярусаў, акрамя пражскага. Залягаюць на глыбінях ад 100 да 1500 м і толькі месцамі па р. Дняпро ў г. Орша, Зах. Дзвіна каля Віцебска, Сар'янка каля г. Верхнядзвінск выходзяць на паверхню. На ПдЗ (Брэсцкая ўпадзіна, Валынская манакліналь) глініста-карбанатныя адклады лохкаўскага яруса магутнасцю да 80 м, у цэнтры і на ПнУ (Аршанская ўпадзіна, Латвійская седлавіна) тэрыгенныя, карбанатныя і эвапарытавыя адклады эмскага, эйфельскага, жывецкага і часткова франскага ярусаў агульнай магутнасцю да 500 м. Да франскага яруса адносяцца вулкана-магматычныя ўтварэнні дыятрэм (трубак выбуху) Жлобінскай седлавіны. Найб. поўны разрэз дэвону (да 3—3,5 тыс. м) ускрыты свідравінамі на ПдУ (Прыпяцкая ўпадзіна), дзе ўтварэнні эйфельскага, жывецкага, франскага і фаменскага ярусаў складзены з магутных тоўшчаў тэрыгенных, карбанатных, саляносных і вулканагенных парод. З адкладамі дэвону звязаны радовішчы карысных выкапняў: нафты (Рэчыцкае, Давыдаўскае, Вішанскае і інш.), солей каменных (Мазырскае) і калійных (Старобінскае, Петрыкаўскае), гаручых сланцаў (Тураўскае, Любанскае), даламітаў (г.п. Руба, Віцебскі р-н), расолаў і мінер. вод.

Літ.: Материалы по стратиграфии Белоруссии. Мн., 1981; Геология и полезные ископаемые кристаллического фундамента и нижней части платформенного чехла Беларуси. Мн., 1996; Решение Межведомственного регионального стратиграфического совещания по среднему и верхнему палеозою Русской платформы: Девонская система. Л., 1990.

С.А.Кручак.

ДЭ́ВЫ, д а й в а , д з і в ы , у іранскай міфалогіі злыя духі. Супрацьпастаўляліся добрым духам *ахурам*. Д. уяўлялі рагатымі, валасатымі, шматгаловымі вяліканамі, якія жылі ў дзіках, цяжкадаступных мясцінах, у нетрах зямлі, дзе ахоўвалі скарбы (каштоўныя металы і камяні). Многія легендарныя іранскія цары і волаты выступалі як дэваборцы.

ДЭГА́ (Degas) Ілер Жэрмэн Эдгар (19.7.1834, Парыж — 27.9.1917), фран-

цузскі мастак. Вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы (1855—56). У Італіі вывучаў мастацтва ранняга Адраджэння (1854—59). Зазнаў уплыў Ж.А.Д.*Энгра*. Пачаў са строгіх па кампазіцыі гіст. карцін і партрэтаў («Сям'я Белелі», каля 1858—60). У 1870-я г. наблізіўся да *імпрэсіянізму*. Захоплены шматвобразнасцю і рухомасцю гар. жыцця, маляваў сучасны яму Парыж (вуліцы, тэатр, кавярні, скачкі) у непарыўна-зменлівых аспектах («Плошча Згоды», каля 1875, «Абсент», 1876, і інш.); адлюстроўваў бытавыя сцэны («Жанчыны на тэрасе кавярні», 1877, «Жанчына расчэсвае валасы», каля 1883, «Прасавальшчыцы», каля 1884, і інш.), у іх выяўляў пластычную прыгажосць чалавека. Маляўнічасцю вылучаюцца пастэльныя творы са сцэнамі балета («Танцоўшчыца ў фатографа», каля

Э.Дэга. Танцоўшчыца ў фатографа. Каля 1877—78.

1877—78, «Зорка», 1878, «Экзамен танца», 1880, і інш.). Напружаны характар набываюць творы Д. 1880—90-х г. (выкананы гал. чынам пастэллю), больш інтэнсіўныя і багатыя па колеры з павялічанымі і амаль плоскаснымі формамі, цеснай прасторай («Блакітныя танцоўшчыцы», каля 1879, і інш.). З канца 1880-х г. шмат займаўся скульптурай. У фігурках балерын, купальшчыц, коней (часта эцюдных па лепцы) дамагаўся пластычна-выразнай перадачы імгненнага руху, вастрыні і нечаканасці позы, захоўваючы цэласнасць і канструктыўнасць фігуры.

Літ.: Русакова Р. Дега. М., 1968.

ДЭГАЗАВА́ЛЬНЫЯ РЭ́ЧЫВЫ, хімічныя злучэнні, якія актыўна рэагуюць з *атрутнымі рэчывамі* і ператвараюць іх у нетаксічныя ці малатаксічныя злучэнні. Адрозніваюць Д.р. акісляльна-хларавальнага дзеяння (гіпахларыты —кальцыевыя і натрыевыя солі хларнавацістай кіслаты, хлораміны) і шчолачныя (сода, гідраксід натрыю, аміячная вада і інш.). Выкарыстоўваюць растворы Д.р. у вадзе ці арган. растваральніках (напр., дыхлорэтане, трыхлорэтане, тэтрахлорэтане, бензіне і інш.) пры дэгазацыі хім. спосабамі.

ДЭГАЗА́ЦЫЯ (ад *дэ*... + *газ*), 1) Д. атрутных рэчываў — зніжэнне да дапушчальных норм ступені заражанасці стойкімі *атрутнымі рэчывамі* мясцовасці, вады, тэхнікі і інш. аб'ектаў. Ажыццяўляюць фіз. і хім. спосабамі. Праводзяць з дапамогай спец. тэхн. сродкаў — прылад, дэгазацыйных машын і інш. для прадухілення ўздзеяння атрутных рэчываў на чалавека і жывёл.

Як паняцце Д. ўзнікла ў перыяд 1-й сусв. вайны, калі пачалі выкарыстоўваць газападобныя атрутныя рэчывы. Фіз. спосабы Д. — выдаленне атрутных рэчываў выпарэннем, змываннем арган. растваральнікамі ці воднымі растворамі паверхнева-актыўных рэчываў, адсорбцый, зразаннем заражанага слоя глебы (снегу), а таксама засыпаннем заражанай паверхні інертнымі матэрыяламі (напр., пяском, шлакам). Найб. эфектыўныя хім. спосабы Д., якія заснаваны на абясшкоджванні атрутных рэчываў з дапамогай *дэгазавальных рэчываў*. Эфектыўная таксама Д. мыццём з выкарыстаннем мыйных сродкаў і карбанату натрыю (кальцыніраванай соды). Пры Д. скурнага покрыва чалавека карыстаюцца універсальнымі дэгазавальнымі растворамі, якія ўваходзяць у камплект індывід. хім. пакета.

2) Д. ў металургіі — выдаленне газаў з вадкага металу. Найб. эфектыўнае вакуумаванне (гл. *Вакуумная металургія*), таксама Д. адбываецца ў працэсе плаўкі, разліўкі, кіпення, перамешвання, адстойвання металу і інш. 3) Д. ў горнай справе — выдаленне руднічных газаў з падземных *горных вырабатак*. Ажыццяўляецца бурэннем свідравін у масіве горных парод, адсмоктваннем газаў з вял. колькасцю метану і інш. *А.П.Чарнякова.*

ДЭГЕ́ЙТЭР, Дэжэйтэр (Degeyter) П'ер (8.10.1848, г. Гент, Бельгія — 27.9.1932), французскі кампазітар. Рабочы, удзельнік рэв. руху. Захапляўся музыкай, спяваў у хоры, кіраваў хар. гурткамі. Аўтар музыкі міжнар. пралетарскага гімна «Інтэрнацыянал» на вершы Э.Пацье (1888; напісаны для пеўчага т-ва «Рабочая ліра» ў г. Ліль), а таксама рэв. песень «Камунар» (словы Пацье), «Наперад, рабочы клас», «Серп і молат» (словы Д.) і інш.

ДЭГЕЛЬМІНТЫЗА́ЦЫЯ (ад *дэ*... + *гельмінты*), комплекс лячэбна-прафілакт. мерапрыемстваў па знішчэнні *гельмінтаў* (паразітычных чарвей) на ўсіх стадыях іх развіцця ў арганізме чалавека ці жывёлы і ў навакольным асяроддзі (глеба, гной). Праводзіцца з лячэбнай, прафілакт. і дыягнастычнай мэтамі з выкарыстаннем процiглісных (антыгельмінтных) сродкаў (гексахлорэтан, піперазін, насенне гарбузоў, філіксан і інш.), высокай т-ры і хірург. аперацый.

ДЭГЕНЕРА́ЦЫЯ (ад *дэ*... + *генерацыя*), выраджэнне, пагаршэнне з пакалення ў пакаленне біял. прыстасавальных або гасп. прыкмет арганізмаў, папуляцый ці экасістэм пад уплывам неспрыяльных умоў існавання, роднасных скрыжаванняў, хвароб і інш. фактараў. Тэрмінам Д. вызначаюць таксама памежныя з біялагічнымі працэсы і з'явы (напр., распад асобы пад уплывам пэўных сац.-эканам. умоў існавання, у выніку алкагалізму, наркаманіі, псіхатропных фактараў). У сельскай гаспадарцы Д. — выраджэнне сартоў культ. раслін, парод свойскай жывёлы.

ДЭГІДРАГЕНА́ЗЫ, ферменты класа *аксідарэдуктаз*, што каталізуюць акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі пераносу вадароду (электрона) ад субстрату да акцэптара. Вельмі пашыраны ў прыродзе, удзельнічаюць у рэакцыях, што складаюць аснову *акіслення біялагічнага* і энергет. забеспячэння клетак (гл. *Дыханне*), некаторыя ў аднаўленчых біясінт. працэсах.

Паводле хім. прыроды Д. — пратэіды з пірымідзінавымі (НАД, НАДФ) ці флавінавымі (ФАД, ФМН) каферментамі — акцэптарамі атамаў вадароду. Падзяляюцца на аэробныя (пераносяць вадарод непасрэдна на малекулярны кісларод) і анаэробныя (акцэптарам вадароду можа быць іншая Д.). Назва Д. даецца па субстраце, што акісляецца (напр., Д., якая дэгідрыруе этылавы спірт, наз. алкагольдэгідрагеназай, малочную кіслату — малатдэгідрагеназай і інш.).

ДЭГІДРАГЕНІЗА́ЦЫЯ, хімічны працэс адшчаплення вадароду (гідрагену) ад малекулы арган. злучэння; рэакцыя, адваротная *гідрагенізацыі*. Звычайна прыводзіць да ўтварэння падвойнай сувязі (C=C, C=O і інш.). Ажыццяўляецца ў прысутнасці каталізатараў або пад уплывам акцэптараў вадароду пры т-ры 300—550 °С і паніжаным ціску (0,1—5 МПа). У чалавека і жывёл Д. — адна са стадый біял. акіслення рэчываў, якія паступаюць у арганізм, адбываецца ў прысутнасці ферментаў — *дэгідрагеназ*. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці этылену з этану, стыролу з этылбензолу, бутадыену з бутану ці бутэнаў, ацэтону з ізапрапілавага спірту і інш.; адбываецца пры тэрмічным *крэкінгу* і каталітычным *рыформінгу*. Гл. таксама *Дэгідрацыклізацыя*.

ДЭГІДРАТА́ЦЫЯ (ад *дэ*... + *гідратацыя*), адшчапленне вады ад малекул арган. або неарган. рэчываў; рэакцыя, адваротная *гідратацыі*.

Ажыццяўляецца тэрмічна ў прысутнасці каталізатараў ці пад уздзеяннем рэчываў, якія звязваюць ваду (напр., серная к-та, аксід фосфару P_2O_5). Адрозніваюць Д. ўнутры- і міжмалекулярную. У выніку ўнутрымалекулярнай Д. арган. злучэнняў утвараюцца кратныя сувязі (напр., сінтэз этылену з этылавага спірту) ці гетэрацыклы (рэакцыі цыкладэгідратацыі). Пры міжмалекулярнай Д. спіртоў утвараюцца простыя эфіры, сумесі спірту і к-ты — складаныя эфіры. Д. арган. і неарган. кіслот атрымліваюць ангідрыды. Да Д. адносіцца таксама абязводжванне — выдаленне крышталізацыйнай вады з крышталегідратаў і вады, адсарбіраванай рэчывам.

ДЭГІДРАЦЫКЛІЗА́ЦЫЯ, рэакцыя ўтварэння бензолу і яго найбліжэйшых гамолагаў (талуолу, ксілолу і інш.) з алканаў і алкенаў, малекулы якіх маюць не менш як 5 атамаў вугляроду ў галоўным ланцугу. Рэакцыя Д. (араматызацыі парафінавых вуглевадародаў) адкрыта сав. хімікамі Б.А.Казанскім і А.Ф.Платэ (1936). Адбываецца на аксідных каталізатарах пры *дэгідрагенізацыі*. Д. над плацінай пры 300 °С гамолагаў бензолу з бакавым ланцугом з 4 і болей атамаў вугляроду атрымліваюць нафталін і яго гамолагі.

ДЭГІ́Ш (цюрк.), катастрафічнае разбурэнне рачных берагоў паводкавымі водамі. Тэрмін ужываецца пераважна ў Сярэдняй Азіі. Напр., у выніку Д. на Амудар'і ў 1940-х г. разбураны г. Туркуль.

ДЭ ГОЛЬ (de Gaulle) Шарль, гл. *Голь* Шарль дэ.

ДЭГРАДА́ЦЫЯ (лац. degradatio літар. зніжэнне), паступовае пагаршэнне, заняпад; зніжэнне або страта станоўчых якасцей.

ДЭГРАДА́ЦЫЯ ПРЫРО́ДЫ, пагаршэнне ці страта станоўчых якасцей *прыроднага асяроддзя*. Тэрмін часцей выкарыстоўваецца ў адносінах да канкрэтных аб'ектаў і кампанентаў прыроднага асяроддзя, напр., дэградацыі глеб (паніжэнне ўрадлівасці глеб, выкліканае прыроднай зменай умоў глебаўтварэння або гасп. дзейнасцю чалавека), *дэструкцыі ландшафтаў*, рэкрэацыйнай дыгрэсіі (гл. *Дыгрэсія*) і інш., папярэджанне якіх складае адну з гал. задач *аховы прыроды*. Да Д.п. адносіцца таксама *біядэградацыя*.

ДЭГУСТА́ЦЫЯ (ад лац. degustatio каштаванне), ацэнка якасці харч. прадуктаў арганалептычным спосабам (органамі зроку, нюху, смаку).

Пры Д. віна вызначаюцца смак, букет, празрыстасць і колер, для пеністых яшчэ і пеністасць. Пры Д. чаю ацэньваецца пах, смак і колер настою, выгляд сухога чаю і развараната ліста. У тытуні вызначаюць пах, смак, моцнасць, наяўнасць у дыме алеістых рэчываў. Дэгустуюць таксама стравы, кансервы і інш. прадукты.

ДЭДА́Л І ІКА́Р, персанажы старажытнагрэчаскай міфалогіі. Дэдал — выдатны вынаходнік, механік, будаўнік, скульптар. Ікар — яго сын. Паводле міфа, Дэдал па загадзе крыцкага цара *Мінаса* пабудаваў лабірынт для *Мінатаўра* і дапамог *Арыядне* вызваліць з лабірынта Тэсея, за што разам з Ікарам быў зняволены. Д. і І. зрабілі з пер'я і воску крылы, бацька даляцеў да Сіцыліі, а сын занадта наблізіўся да сонца, воск на крылах растапіўся, Ікар зваліўся ў мора і загінуў. Вобраз Ікара, чалавека, які ўзляцеў да сонца, часта выкарыстоўваецца ў л-ры, выяўл. мастацтве, музыцы.

ДЭ́ДВЕЙТ (англ. deadweight, літар. мёртвы груз), поўная *грузападымальнасць* судна (сумарная маса грузу, пасажыраў, экіпажа, паліва і інш.). Д. пры асадцы па *грузавую марку* — асн. эксплуатацыйная характарыстыка марскога судна. Д. роўны рознасці паміж водазмяшчэннем і ўласнай масай судна з гатовымі да дзеяння механізмамі (з запоўненымі паліўнымі трубаправодамі, вадой у катлах і цеплаабменніках і інш.).

ДЭ ДЗЮЎ (De Duve) Крысціян Рэнэ (н. 2.10.1917, Тэмс-Дытан, каля Лондана), бельгійскі біяхімік. Чл. Карале-

К.Р.Дэ Дзюў.

ўскай бельг. АН, літаратуры і выяўл. мастацтва, Каралеўскай мед. акадэміі Бельгіі, Нац. АН ЗША, Амер. акадэміі навук і мастацтваў, Парыжскай АН, Германскай акадэміі даследчыкаў прыроды «Леапальдзіна». Скончыў ун-т у Лувене (Бельгія, 1941). З 1947 працаваў у ім (з 1951 праф.), з 1962 у Ракфелераўскім ун-це ў Нью-Йорку. Заснавальнік і прэзідэнт Міжнар. ін-та клетачнай і малекулярнай паталогіі ў Бруселі. Навук. працы па біяхіміі інсуліну, глюкагону, распрацаваў метад дыферэнц. цэнтрыфугавання і адкрыў з яго дапамогай субклетачныя структуры — лізасомы (1963), выявіў іх прыроду, развіў канцэпцыю пра функцыі (1964) і ўдзел лізасом у фізіял. працэсах у клетках. Нобелеўская прэмія 1974 (разам з А.*Клодам* і Дж.Э.*Паладэ*).

ДЭДУ́КЦЫЯ (ад лац. deductio вывядзенне), спосаб вывядзення заключэнняў ад агульнага да канкрэтнага і адзінкавага, ад агульных разважанняў да канкрэтных або інш. вывадаў. У шырокім сэнсе — любы вывад увогуле, без якога не абыходзяцца паўсядзённыя разважанні і працэс пабудовы навук. тэорый. Упершыню тэорыя Д. распрацавана Арыстоцелем, сустракаецца ў творах Баэцыя. Ф.Бэкан недаацэньваў ролю Д. ў працэсе навук. пазнання. Р.Дэкарт супрацьпастаўляў Д. інтуіцыі. Г.Лейбніц выказваў ідэю пабудовы логікі як вылічэння, паставіў задачу вывучэння лагічных уласцівасцей адносін з мэтай пашырэння сродкаў дэдукцыйнага вываду. У сучаснай логіцы Д. разумеюць як абагульнены вывад, у якім з выказванняў, што існуюць, па правілах логікі будуецца новае (заключэнне), а выказванні, з якіх яно атрымліваецца, наз. пасылкамі. Пасылкі размяшчаюцца вольна, тэарэт. ланцуг можа быць вялікім, але заўсёды мае канец. Калі пасылкі праўдзівыя і правілы дэдукцыйнага вываду не парушаны, то заключэнне заўсёды ісціннае. Д. цесна звязана з назіраннем, эксперыментам (гл. *Дослед*) і *індукцыяй*. Ужываецца для пабудовы навук. тэорый у матэматыцы, логіцы, а таксама фізіцы, біялогіі, сацыялогіі і інш. навуках. Складанымі з'яўляюцца філас. праблемы, якія звязаны з дэдукцыйнымі вывадамі і даследуюцца ў розных кірунках філасофіі (напр., эмпірызме, рацыяналізме, марксізме і інш.). Метады і правілы Д. вывучаюцца логікай, тэорыяй пазнання і псіхалогіяй. Дэдукцыйныя працэсы, што вывучаюцца матэм. сродкамі, можна аўтаматызаваць з дапамогай ЭВМ.

Літ.: Логика научного познания. М., 1987; Пугач Г.В. Познавательная активность человека. М., 1985; Стереотипы и динамика мышления. Мн., 1993. *В.М.Пешкаў.*

ДЭ́ДЭКІНД (Dedekind) Юліус Вільгельм Рыхард (6.10.1831, г. Браўншвайг, Германія — 12.2.1916), нямецкі матэматык. Чл. Берлінскай (1880) і Парыжскай (1910) АН. Вучыўся ў Гётынгенскім ун-це ў К.Гаўса і П.Дзірыхле. У 1862—1912 праф. Вышэйшай тэхн. школы ў Браўншвайгу. Навук. працы па тэорыі алгебраічных лікаў. Стварыў шэраг агульных канцэпцый сучаснай алгебры, у прыватнасці ўвёў паняцце кольца, даў сучаснае вызначэнне ідэала ў матэматыцы. Д. — аўтар адной з сістэм строгага абгрунтавання тэорыі рэчаісных лікаў.

Літ.: Стройк Д.Я. Краткий очерк истории математики.: Пер. с нем. 2 изд. М., 1969. С. 219—221.

ДЭДЭРО́Н (ням. Dederon ад скарачэння DDR), гандлёвая назва *поліамідная валакна* і тканіны з гэтага валакна, што выпускаліся ў ГДР.

ДЭЗ... (франц. dés... ад ..., раз...), прыстаўка, якая абазначае знішчэнне, выдаленне, спыненне або адсутнасць чаго-н., напр., *дэзінфекцыя, дэзінфармацыя*.

ДЭЗАВУ́ІРАВАННЕ (ад франц. désavouer адмаўляцца, выказваць неадабрэнне), заява пра нязгоду з дзеяннямі сваёй даверанай асобы ці аб тым, што дадзеная асоба не ўпаўнаважана дзейнічаць ад імя заяўніка. У міжнар. праве — заява кіраўніка дзяржавы ці ўрада аб тым, што дыпламат. прадстаўнік або інш. афіц. асоба дзейнічала без адпаведнага даручэння ці з перавышэннем паўнамоцтваў.

ДЭЗАДАРА́НТЫ (ад *дэз...* + лац. odor пах), сродкі для аслаблення ці знішчэння дрэннага паху; кампазіцыі арган. злучэнняў — спіртоў, альдэгідаў, вытворных вышэйшых тлустых кіслот, прыродных і сінт. пахучых рэчываў і інш. з рознымі дабаўкамі. Паводле прызначэння адрозніваюць Д. паветра (для памяшканняў, вопраткі і інш.) і гігіенічныя (касметычныя для знішчэння паху поту, асвяжэння цела і поласці рота), якія звычайна маюць рэчывы, што

памяншаюць выдзяленне поту (фармалін, уратрапін) ці аказваюць дэзінфіцыруючае дзеянне.

ДЭЗАДАРА́ЦЫЯ, пазбаўленне ад непрыемнага паху цела чалавека, памяшканняў і хім. рэчываў з дапамогай спец. саставаў (*дэзадарантаў*). Дасягаецца вентыляцыяй памяшканняў, выкарыстаннем дэзадарантаў (у ветэрынарыі — торф, драўняны вугаль, марганцавакіслы калій, фармалін, хлорная вапна, азон і інш.), своечасовай фіз. і хім. апрацоўкай адходаў і нечыстот. Да дэзадарантаў цела часта дабаўляюць касметычныя сродкі — ласьёны, крэмы, пасты і інш. Д. папярэднічае гігіенічная апрацоўка.

ДЭЗАКТЫВА́ЦЫЯ (ад *дэз...* + лац. activus дзейны, актыўны), выдаленне радыеактыўных рэчываў з паверхні розных аб'ектаў: глебы, будынкаў і збудаванняў, зброі, тэхнікі, адзення, прадуктаў харчавання і інш.; адно з мерапрыемстваў па ліквідацыі наступстваў аварый, звязаных з выкідамі радыеактыўных рэчываў або выкарыстаннем ядз. боепрыпасаў. Абясшкоджванне ад радыеактыўных рэчываў вадкіх і газападобных асяроддзяў наз. ачысткай. Вытворчая Д. ажыццяўляецца пры эксплуатацыі АЭС, у працэсе тэхнал. цыкла атрымання ядз. паліва, пры абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі і зняцці АЭС з эксплуатацыі. Ступень забруджвання аб'ектаў вызначаецца *дазіметрычнымі прыладамі*.

Д. ўключае сукупнасць аперацый з выкарыстаннем сродкаў па выдаленні радыеактыўных забруджванняў з аб'ектаў або ізаляцыі іх паверхняў. У залежнасці ад агрэгатнага стану дэзактывуючага асяроддзя спосабы Д. падзяляюцца на вадкасныя, бязвадкасныя і камбінаваныя. Вадкасную Д. праводзяць струменем вады, дэзактывуючымі растворамі, мыцём ці экстракцыяй; бязвадкасную Д. — струменем газу або паветра, пылаадсмоктваннем, зняццем забруджанага слоя, ізаляцыяй забруджанай паверхні; камбінаваную Д. — праціранне шчоткамі ці анучкамі, апрацоўкай парай, пакрыццём паверхні спец. плёнкамі, якія хутка зацвердзяваюць. Д. мясцовасці праводзіцца заглыбленнем забруджанага пласта грунту пры дапамозе глыбокага ўзворвання. Пасля Чарнобыльскай катастрофы Д. ажыццяўлялася ў шырокіх маштабах на тэр. прамысл. пляцоўкі АЭС і ў населеных пунктах. У зонах радыеактыўнага забруджвання Д. праводзіцца дзярж. спецыялізаванымі прадпрыемствамі на найб. важных і сацыяльна-значных аб'ектах (школы і дашкольныя ўстановы, бальніцы, месцы адпачынку і масавага знаходжання людзей, прамысл. прадпрыемствы і інш.). Гл. таксама *Засцярога ад зброі масавага знішчэння, Засцярога супраць іанізавальнага выпрамянення*.

У.У.Скурат.

ДЭЗАМІ́ (Dezamy) Тэадор (4.3.1803, г. Люсон, Францыя — 24.7.1850), французскі камуніст-утапіст. Удзельнік Рэвалюцыі 1848, паслядоўнік Ф.Н.*Бабёфа*. У 1830-я г. чл. бланкісцкага «Таварыства праў года». У 1848 заснаваў газ. «Les droits de l'homme. Tribune des proletaires» («Правы чалавека. Трыбуна пралетарыяту»), дзе крытыкаваў капіталізм, прычыны прыгнёту прац. мас бачыў у прыватнай капіталіст. уласнасці, антаганізме класаў. Асн. праца «Кодэкс супольнасці» (1842), у якой выклаў свае погляды на асновы і арг-цыю будучага грамадства, заснаванага на супольнасці. Прапагандаваў ідэі камунізму, змагаўся супраць дробнамяшчанскага сацыялізму Л.А.*Бланкі*, ідэй хрысц. сацыялізму.

ДЭЗАМІНА́ЗЫ, ферменты класа *гідралаз*, якія каталізуюць гідроліз С—N-сувязі, адрозныя ад пептыднай. Пашыраны ў прыродзе, многія ўдзельнічаюць ва ўтварэнні канчатковых прадуктаў азоцістага абмену. У выніку рэакцый, што працякаюць з удзелам Д., утвараецца аміяк ці мачавіна, адбываецца распад кольцаў цыклічных амідзінаў.

ДЭЗА́РГ (Désargues) Жэрар (2.3.1593, г. Ліён, Францыя — 8.10.1662; паводле інш. звестак 1591—1661), французскі матэматык, архітэктар і інжынер. Заснавальнік нарысоўнай і праектыўнай геаметрыі. Выкарыстоўваў перспектыўнае відарысаўтварэнне фігур. Увёў у геаметрыю паняцці бясконца аддаленых элементаў і палярнасці. Даказаў адну з асн. тэарэм праектыўнай геаметрыі (*Дэзарга тэарэма*). Адкрыў эпіцыклоіду і выкарыстаў яе для прафілявання зубоў зубчастых колаў.

Літ.: Вилейтнер Г. История математики от Декарта до середины XIX столетия: Пер. с нем. 2 изд. М., 1966.

ДЭЗА́РГА ТЭАРЭ́МА, адна з асноўных тэарэм *праектыўнай геаметрыі*. Сцвярджае: калі адпаведныя стораны (ці іх прадаўжэнні) 2 трохвугольнікаў $A_1B_1C_1$ і $A_2B_2C_2$ перасякаюцца ў пунктах *P, Q, R*, размешчаных на адной прамой, то прамыя, якія злучаюць адпаведныя вяршыні трохвугольнікаў, перасякаюцца ў адным пункце 0. Справядліва і адваротнае сцвярджэнне: калі прамыя, якія злучаюць адпаведныя вяршыні 2 трохвугольнікаў, праходзяць праз адзін пункт 0, то 3 пункты *P, Q, R* перасячэння адпаведных старон трохвугольнікаў ляжаць на адной прамой. Устаноўлена Ж.*Дэзаргам* (1648).

ДЭЗАРГАНІЗА́ЦЫЯ (ад *дэз...* + *арганізацыя*), парушэнне парадку, дысцыпліны, нармальнай дзейнасці ў якой-н. справе, рабоце; беспарадак, разладжанасць, развал.



Да арт. **Дэзарга тэарэма**.

ДЭЗАРЫЕНТА́ЦЫЯ (ад *дэз...* + *арыентацыя*), 1) пазбаўленне правільнай арыентацыі, правільнага ўяўлення аб чым-н. (напр., часе і прасторы). 2) Увядзенне каго-н. у зман.

ДЭЗЕРЦІ́РСТВА (ад франц. déserteur), воінскае злачынства, якое заключаецца ў самавольным пакіданні вайск. часці або інш. падраздзялення з мэтай ухілення ад ваен. службы. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь Д. лічыцца таксама няяўка ваеннаслужачага з той жа мэтай на службу пры назначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, водпуску або з лячэбнай установы. Адказнасць за Д. настае незалежна ад працягласці часу, на працягу якога ваеннаслужачы знаходзіўся па-за межамі часці ці месца службы. Д. караецца пазбаўленнем волі, у ваенны час — нават пакараннем смерцю.

ДЭЗІНВА́ЗІЯ (ад *дэз...* + *інвазія*), комплекс мерапрыемстваў па знішчэнні ў вонкавым асяроддзі зародкавых і лічынкавых форм узбуджальнікаў інвазійных хвароб жывёл, чалавека і раслін. Аб'екты Д. — памяшканні, глеба, гной і інш. Ажыццяўляецца мех., фіз., хім. і біял. спосабамі.

ДЭЗІНСЕ́КЦЫЯ (ад *дэз...* + лац. insectum насякомае), комплекс ветэрынарна-сан. мерапрыемстваў па знішчэнні або зніжэнні колькасці шкодных членістаногіх (насякомых, кляшчоў і інш.). Метады Д.: мех. (сеткі, ліпкія стужкі, пасты, ачыстка ферм і тэрыторый), фіз. (уздзеянне высокіх і нізкіх тэмператур, гама-выпрамянення), хім. (*інсектыцыды*), біял. (выкарыстанне прыродных ворагаў членістаногіх — птушак, рыб, бактэрый, вірусаў, грыбоў). Выкарыстоўваюць супраць пераносчыкаў узбуджальнікаў інфекц. і інвазійных хвароб жывёл, чалавека і раслін, а таксама свірнавых шкоднікаў.

ДЭЗІНТЭГРА́ТАР (ад *дэз...* + лац. integer цэлы), 1) машына для грубага здрабнення крохкіх малаабразіўных матэрыялаў (вугалю, гіпсу, серы, торфу, драўніны і інш.). Складаецца з двух ротараў, якія зманціраваны на асобных сувосевых валах і верцяцца ў процілеглых напрамках. На дысках ротараў размешчаны па канцэнтрычных акружнас-



Дэзінтэгратар: 1 — загрузачны бункер; 2, 3 — ротары з пальцамі; 4 — вал; 5 — махавік.

цях 2—4 рады цыліндрычных пальцаў (білаў). Матэрыял паступае ў цэнтр. ч. ротара, пры яго вярчэнні адкідваецца ад цэнтра і здрабняецца ўдарамі пальцаў. 2) Апарат для ачысткі прамысл. газаў ад узважаных цвёрдых (пыл) або вадкіх часціц. Выкарыстоўваецца пераважна ў доменных цэхах.

ДЭЗІНФАРМА́ЦЫЯ (ад *дэз...* + *інфармацыя*), ілжывая, заведама няправільная інфармацыя; свядомае распаўсюджванне скажоных звестак, паведамленняў для дасягнення паліт., ваен. і інш. мэт, увядзення ў зман працаўніка, падбаўлення правільнай арыентацыі людзей, тых або інш. сіл, арг-цый у бягучых падзеях паліт. жыцця (гл. таксама *Дэзарыентацыя*).

ДЭЗІНФЕКЦЫ́ЙНАЯ СТА́НЦЫЯ, санітарна-процівэпідэмічная ўстанова, якая ажыццяўляе сістэму мер па знішчэнні ўзбуджальнікаў інфекц. хвароб чалавека і жывёл. Праводзіць прафілакт. і процівэпідэмічную *дэзінфекцыю*, эвакуацыю інфекц. хворых і падазроных на гэтыя хваробы, сан. апрацоўку людзей, якія былі ў кантакце з інфекц. хворымі. Ажыццяўляе кантроль за станам дэзінфекц. тэхнікі і правядзеннем штодзённай дэзінфекцыі лячэбна-прафілакт. ўстановамі і інш. На Беларусі першая Д.с. адкрыта ў 1939 у Мінску. У 1997 дзейнічаюць 3 Д.с. Асн. структурныя аддзяленні Д.с.: эвакуацыі інфекц. хворых і ачаговай дэзінфекцыі; камернай дэзінфекцыі і сан. апрацоўкі; прафілакт. дэзінфекцыі; лабараторыі.

ДЭЗІНФЕ́КЦЫЯ (ад *дэз...* + *інфекцыя*), спосабы поўнага ці выбіральнага знішчэння патагенных для чалавека і жывёл мікраарганізмаў на шляху перадачы ад крыніцы інфекцыі да здаровага арганізма. Робяць Д. хім. рэчывамі (дэзінфетантамі), фіз. (кіпячэнне, абпальванне, ультрафіялетавым і радыяцыйным выпрамяненнем і інш.) і біял. (бактэрыяфагі, фільтры) дэзінфекцыйнымі сродкамі. У ачагах інфекцыі (бальніцы, дзіцячыя і грамадскія ўстановы) робяць прафілактычную Д., калі ёсць хворы ці бактэрыяносьбіт — бягучую Д., пасля іх выдалення з памяшкання — заключную Д. У ветэрынарыі аб'ектамі Д. з'яўляюцца жывёлагадоўчыя памяшканні, прадметы догляду за жывёлай, збруя, трансп. сродкі для перавозкі жывёл і прадуктаў жывёльнага паходжання, месцы забою жывёл, перапрацоўкі і захавання прадуктаў жывёльнага паходжання, рыбагасп. вадаёмы, гной.

А.П.Красільнікаў.

ДЭЗІНФЛЯ́ЦЫЯ, гл. *Дэфляцыя.*

ДЭЗОКСІКОРТЫКАСТЭРО́Н, кортэксон, стэроідны гармон кары надныракавікаў; прамежкавы прадукт біясінтэзу кортыкастэрону і альдастэрону. Рэгулюе водна-салявы абмен у арганізме. Утвараецца пераважна з прагестэрону. Прэпарат Д. (Д.-ацэтат) уводзяць у мышцы пры адысонавай хваробе, знікненні функцыі надныракавікаў, гіпатаніі.

ДЭЗОКСІРЫБАНУКЛЕА́ЗЫ, ДНК-азы, ферменты класа нуклеаз, якія каталізуюць расшчапленне фосфадыэфірных сувязей у полінуклеатыдных ланцугах ДНК. Шырока прадстаўлены ў клетках жывёл, раслін і мікраарганізмаў. Удзельнічаюць у рэгуляванні распаду і сінтэзу ДНК, аднаўленні структуры яе малекул праз выдаленне пашкоджаных участкаў. Уласцівасць Д. аднаўляць структуры малекул выкарыстоўваюць у генной інжынерыі пры выдаленні ці ўманціраванні ў малекулу ДНК патрэбнага гена.

ДЭЗОКСІРЫБАНУКЛЕАПРАТЭ́ІДЫ, бялкі, здольныя звязвацца з малекуламі ДНК праз утварэнне вадародных сувязей. Звязванне можа адбывацца па ўсёй даўжыні малекулы (гістонавыя бялкі) ці на працягу пэўных кароткіх не паслядоўнасцей (сайт-спецыфічныя бялкі). Удзельнічаюць у працэсах рэпліцыравання і счытвання інфармацыі з малекул ДНК, іх упакоўкі ў храмацін, згортвання малекул ДНК з утварэннем розных даменаў, у кантролі за транскрыпцыяй генаў і інш. Кожнаму тыпу клетак жывых арганізмаў уласцівы пэўны набор Д. негістонавай прыроды, які ў сукупнасці вызначае характар экспрэсіі генаў.

ДЭЗОКСІРЫБАНУКЛЕ́ІНАВАЯ КІСЛАТА́, ДНК, біяпалімер, складзены з нуклеатыдаў, якія маюць у сваім саставе *дэзоксірыбозу*; неабходная састаўная частка жывой матэрыі. Спецыфіка будовы ДНК абумоўлівае спадчынную перадачу прыкмет і ўласцівасцей большасці арганізмаў і сінтэз спецыфічных кожнаму арганізму бялкоў. Малекулы ДНК усіх арганізмаў пабудаваны па адным тыпе. Паводле схемы, распрацаванай амер. вучоным Дж.Уотсанам і англ. Ф.Крыкам (1953), яны складаюцца з двух спіральна закручаных адзін вакол аднаго палімерных ланцугоў. Ланцугі пабудаваны з вял. колькасці нуклеатыдаў, якія маюць дэзоксірыбозу, злучаную з фосфарнай к-той і азоцістай асновай (адэнінам, гуанінам, тымінам, цытазінам); спецыфічнасць нуклеатыдаў вызначаецца адной з 4 азоцістых асноў. Розны нуклеатыдны склад і паслядоўнасць 4 азоцістых асноў у малекуле ДНК вызначаюць разнастайнасць відаў жывых арганізмаў. Пры размнажэнні арганізмаў, клетак адбываецца капіраванне (рэплікацыя) і перадача ДНК у даччыныя клеткі. Парушэнне паслядоўнасці нуклеатыдаў у ланцугу ДНК прыводзіць да спадчынных змен у арганізме — *мутацыі*.

Мадэль **дэзоксірыбануклеінавай кіслаты**.

ДЭЗОКСІРЫБО́ЗА, монацукрыд пентоза з групы *дэзоксіцукроў*. Пашырана ў прыродзе: у форме 2-дэзоксі-D-рыбозы ўваходзіць у састаў нуклеазідаў, нуклеатыдаў і полінуклеатыдных ланцугоў дэзоксірыбануклеінавай кіслаты (ДНК).



2-дэзоксі-D-рыбоза

ДЭЗОКСІЦУКРЫ́, монацукрыды, у малекулах якіх адна або некалькі гідраксільных груп замешчаны атамамі вадароду. Вядома каля 100 Д. Паводле хім. будовы падзяляюцца на дэзоксіальдозы (вельмі пашыраны, напр., *дэзоксірыбоза*) і дэзоксікетозы (вядома некалькі, надзвычай пашыраны іх вытворныя, напр., *нейрамінавая кіслата* і *сіялавыя кіслоты*). Большасць вытворных Д. маюць Д-форму, многія Д- і L-формы атрыманы сінтэтычна.

ДЭЗУРБАНІ́ЗМ (ад *дэз...* + *урбанізм*), кірунак у горадабудаўніцтве 20 ст., які азначае разгрупоўку насельніцтва, зніжэнне ролі гарадоў аж да поўнага іх адмаўлення; супрацьлеглы *урбанізму*. Выкліканы канцэнтрацыяй шкоднай вытв-сці ў буйных гарадах, парушанай экалогіяй, адарванасцю чалавека ад прыроды. Ідэі Д. ўвасобіліся ў палітыцы абмежавання росту вял. гарадоў і вызначэнні іх памераў, распрацоўцы гарадоў-садоў (Лечуарт, Англія, 1902—03; арх. Р.Ануін; комплекс Ла Мюэт у Дрансі каля Парыжа, 1930—34, арх. Э.Бадуэн, М.Лодс і інш.), гарадоў-спадарожнікаў.

Ідэі Д. ўзніклі ў утапістаў (Ш.Фур'е, Р.Оўэн і інш.), якія бачылі ідэал у малых пасяленнях. Распрацаваны ў кнізе Э.Хоўарда «Заўтра» (1898), увасобіліся ў работах Э.Саа-

рынена (арганічная дэцэнтралізацыя г. Хельсінкі, 1918), М.Гінзбурга (ідэя непарыўнага лінейнага 2—3-павярховага дома для стварэння Зялёнага горада пад Масквой, 1928). Сярод самых вядомых праекты па буд-ве г. Магнітагорск (1930, арх. М.Ахітовіч, М.Баршч, І.Леанідаў і інш.), у якіх адмаўляліся і горад і вёска, прапаноўваліся жылыя паясы (25 км), што сыходзіліся да вытв. комплексаў; побач размяшчаліся с.-г. тэрыторыі і зоны адпачынку.

На Беларусі канцэпцыі Д. часткова адбіліся ў прапановах (1968—87) па рассяленні насельніцтва, абмежаванні росту Мінска і абл. цэнтраў, развіцці малых гар. пасяленняў і стварэнні ўзаемазвязаных груп гар. і сельскіх населеных пунктаў (І.Сянкевіч, І.Іода, Ю.Шпіт і інш.).

Літ.: Хорев Б.С. Проблемы городов. 2 изд. М., 1975; Груза И. Теория города: Пер. с чеш. М., 1972; Иодо И.А. Основы градостроительства: Теория, методология. Мн., 1983. *І.А.Іода.*

ДЭІАНІЗА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *іанізацыя*), знікненне іонаў у газе пасля спынення знешняга ўздзеяння, якое прыводзіць да іанізацыі. Выклікаецца працэсамі дыфузіі на сценкі, што абмяжоўваюць аб'ём з газам, і рэкамбінацыяй іонаў і электронаў.

ДЭІДЭАЛАГІЗА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *ідэалогія*), 1) плынь у зах. грамадска-паліт. і філас. думцы 2-й пал. 20 ст. Узнікла на глебе адмаўлення ідэалагізаваных форм інтэрпрэтацыі сучасных грамадска-гіст. працэсаў, сцвярджэння непрыдатнасці ідэалогіі ў якасці сродку пазнання грамадства. Тэарэт. падставай Д. сталі погляды ням. сацыёлага К.*Мангейма* аб супрацьпастаўленні навукі і ідэалогіі, дзе апошняя траціць права на валоданне навук. ісцінай. У 1950—60-я г. ў працах Р.*Арона*, Д.*Бела*, К.*Попера* і інш. Д. набыла рысы паліт. канцэпцыі. На падставе паляпшэння матэрыяльных умоў жыцця ў высакаразвітых краінах Захаду абвешчана выснова пра «згасанне» ў гэтых краінах класавай барацьбы і паступовае знікненне саміх класаў. Канцэнтраваным увасабленнем канцэпцыі Д. лічыцца палажэнне аб «канцы веку ідэалогіі», якое дапаўняе тэорыі *індустрыяльнага грамадства* і *постіндустрыяльнага грамадства*. Паводле гэтых тэорый, змены тыпу грамадскай арг-цыі пад уплывам навук.-тэхн. рэвалюцыі, становішча класаў, сац. груп і нацый вядуць да стварэння «новага светапогляду», які абапіраецца выключна на «факты навукі» і адмаўляе навук. вартасць і значэнне абстрактна-тэарэт. ідэй. 2) У шырокім сэнсе Д. — незалежнасць ад уплыву пэўных ідэалаг. прынцыпаў. *В.І.Боўш.*

ДЭ́ІЗМ (ад лац. deus Бог), рэлігійна-філасофскае вучэнне, паводле якога Бог з'яўляецца толькі першаствараль нікам свету, які ў далейшым развіваецца па сваіх уласных законах. Д. адрозніваюць ад *тэізму* (прызнае боскую наканаванасць і пастаянную сувязь чалавека і Бога), *пантэізму* (атаясамлівае Бога і сусветнае цэлае) і *атэізму* (адмаўляе існаванне Бога наогул). Пачынальнік Д. англ. філосаф 17 ст. Э.*Чэрберы*, які развіваў ідэі натуральнай рэлігіі, або рэлігіі розуму. Найб. росквіту Д. дасягнуў у Вялікабрытаніі ў 1-й пал. 18 ст. (Дж.Толанд, Дж.А.Колінз, А.Шэфтсберы і інш.). Ідэі Д. праводзілі Вальтэр, Ж.Ж.Русо (Францыя), Г.Лейбніц, Г.Лесінг, І.Кант (Германія), Т.Джэферсан (ЗША), І.П.Пнін, А.С.Лубкін, А.М.Радзішчаў (Расія). У Беларусі элементы Д. характэрны для светапогляду філосафа і паэта 17 ст. Я.Белабоцкага, прадстаўніка ранняга Асветніцтва К.Нарбута. На пазіцыях Д. стаялі бел. асветнік І.Страйноўскі, праф. Гал. школы ВКЛ К.Багуслаўскі і інш. Д. садзейнічаў развіццю вальнадумства, з'яўляўся формай барацьбы з тэалогіяй і містыкай. *Т.І.Адула.*

ДЭ́ЙВІС (Davis) Бэт (Рут Элізабет; 5.4.1908, г. Лоўэл, штат Масачусетс, ЗША — 6.10.1989), амерыканская актрыса. Адукацыю атрымала ў драм. школе. З 1928 выступала ў т-рах Брадвея. З 1931 у кіно. Напачатку выконвала ролі інжэню і «ракавых спакусніц». У 1934 у фільме «Цяжар пачуццяў чалавечых» (паводле У.С.Моэма) упершыню паказала складаны, супярэчлівы ўнутр. свет чалавека. Стварала вобразы валявых, незалежных жанчын, здольных выжыць насуперак лёсу. Сярод фільмаў: «Іезавель», «Змрочная перамога», «Лісічкі», «Усё пра Еву», «У цэнтры буры», «Што здарылася з Бэбі Джэйн?», «Жнівеньскія кіты».

ДЭ́ЙВІС (Davis) Джон (каля 1550, Сандрыдж, каля г. Дартмут, Вялікабрытанія — 29.12.1605), англійскі мараплавец. Здзейсніў 3 плаванні (1585—87) з мэтай адшукання паўн.-зах. праходу з Атлантычнага ак. ў Ціхі, але знайсці гэты шлях ён не змог. Д. адкрыў праліў на З ад Грэнландыі, названы яго імем (Дэйвіса праліў), даследаваў зах. бераг Грэнландыі (да 73° паўн. ш.) і ўсх. бераг п-ва Лабрадор. У 1591—92 камандаваў караблём у экспедыцыі англ. карсара Т.Кавендыша, у час якой зрабіў пачатак адкрыццю Фалклендскіх а-воў.

ДЭ́ЙВІС (Davis) Майлс Дзьюі (25.5.1926, г. Олтан, штат Ілінойс, ЗША — 28.9.1991), амерыканскі джазіст, трубач, кампазітар; адзін з вядучых прадстаўнікоў і наватараў сучаснага *джаза*. Выступаў з 1941 у Сент-Луісе, з 1945 у Нью-Ёрку. Кіраваў многімі ансамблямі. Першы (разам з Ч.Паркерам) эксперыментаваў у стылях *бібоп* (1945), *кул-джаз* (1950-я г.), *джаз-рок* (з канца 1960-х г.). Звяртаўся да стылю дыска, *поп-музыкі*, запрашаў у ансамбль рок-музыкантаў. У 1968 пачаў іграць на электраінструментах, дадаў электроннае прыстасаванне да сваёй трубы, павялічыў колькасць ударных інструментаў у ансамблі. Сярод альбомаў Д.: «Нараджэнне кула» (1957), «Іспанскія замалёўкі» (1959), «Заваруха» (1970), «Балетная пачка» (1985). Аўтар музыкі да кінафільма «Ліфт на эшафот» (1958).

Літ.: Симоненко В.С. Лексикон джаза. Киев, 1981; Конен В.Д. Пути американской музыки. 3 изд. М., 1977.

ДЭ́ЙВІС (Davies) Пітэр Максвел (н. 8.9.1934, г. Манчэстэр, Вялікабрытанія), англійскі кампазітар. Скончыў муз. каледж (1956) і ун-т (1957) у Манчэстэры. У 1959—62 муз. кіраўнік школы ў г. Сайрэнсестэр, з 1966 выкладаў кампазіцыю ва ун-це г. Адэлаіда (ЗША). З 1985 дырыжор Шатландскага сімф. аркестра Бі-Бі-Сі. У 1967 арганізаваў інстр. ансамбль «Піера-плэерс» у Лондане (з 1970 «Агні Лондана»). Распрацаваў сістэму муз. выхавання дзяцей. Сярод твораў: муз.-сцэн. «Восем песень для звар'яцелага кароля» (1969), оперы «Таверне» (1972), «Маяк» (1980), балет «Саламея» (1978); 2 сімфоніі (1976, 1980); саната для 17 духавых інструментаў «Святы Міхаіл» (1957); камерна-інстр. ансамблі; 5 матэтаў для хору а капэла (1959); музыка для дзяцей, у т.л. «Календары пастухоў» (1965), і інш.

ДЭ́ЙВІС (Davis) Уільям Морыс (12.2.1850, г. Філадэльфія, ЗША — 5.2.1934), амерыканскі геолаг і географ. Скончыў Гарвардскі ун-т (1870) і працаваў у ім з 1876. Праф. (1890). Заснавальнік Асацыяцыі амер. географаў (1904) і прэзідэнт Амерыканскага геал. т-ва (1911), ганаровы чл. многіх геал. і геагр. т-ваў (у т.л. Рускага геагр. т-ва). У 1890—1915 працаваў у Геал. службе ЗША, вёў даследчую работу ў розных раёнах ЗША, у краінах Паўд. Амерыкі і Зах. Еўропы. У 1903 пабываў у пустынных раёнах Туркестана. У 1890-х г. распрацаваў вучэнне аб геагр. цыклах (тэорыя развіцця рэльефу зямной паверхні). Стварыў школу геаморфолагаў. Увёў новы тып адлюстравання рэльефу — блок-дыяграмы, мадэлі.

ДЭ́ЙВІСА МО́РА (Davis Sea), ускраінае мора Індыйскага ак., каля берагоў Усх. Антарктыды. Абмывае Бераг Праўды. Пл. 21 тыс. км². Глыб. да 1369 м. Салёнасць 33—33,5‰. Круглы год укрыта льдамі. На ўзбярэжжы — антарктычная навук. станцыя Мірны (Расія). Названа ў гонар капітана аўстрал. экспедыцыйнага судна «Аўрора» Дж.К.Дэйвіса.

ДЭ́ЙВІСА ПРАЛІ́Ў (Davis Strait), праліў паміж а-вамі Грэнландыя і Бафінава Зямля (Канада). Злучае м. Бафіна Паўн. Ледавітага ак. і м. Лабрадор Атлантычнага ак. Даўж. 1170 км, найменшая шыр. 360 км, глыб. ад 104 да 466 м. Дрэйфуючыя льды і айсбергі. Названы ў гонар Дж.*Дэйвіса*.

ДЭЙК (Dyck) Антоніс ван (22.3.1599, г. Антверпен, Бельгія — 9.12.1641), фламандскі мастак. Вучыўся ў Амстэрдаме (1609—10). Сярод ранніх твораў (да 1618) партрэты і карціны на рэліг. і міфалагічныя сюжэты («Я.Вермёлен», «Распяцце св. Пятра», «Юпітэр і Антыёпа»). Працуючы памочнікам

П.П.*Рубенса*, зазнаў яго ўплыў («Іаан Хрысціцель і Іаан Евангеліст», 1618). У канцы 1620 — пач. 1621 мастак англ. караля Якава I. Творы гэтага часу («Сямейны партрэт», «Ф.Снейдэрс з жонкай», «Св. Марцін») вызначаліся імкненнем да стварэння адухоўленага вобраза, цікавасцю да эмацыянальнага і інтэлектуальнага жыцця чалавека. З канца 1621 жыў у Італіі, дзе выпрацаваў і давёў да дасканаласці тып барочнага параднага партрэта («Кардынал Г.Бентывольё»). У партрэтах генуэзскай знаці («Маркіз А.Дж.Брыньё-ле-Сале і яго жонка Пааліна Адорна», «Дама з дзяўчынкай») адчуваецца ўплыў *венецыянскай школы жывапісу*. У 1627—32 жыў у Антверпене; з 1630 прыдворны мастак эрцгерцагіні Ізабелы. У гэты перыяд стварыў лепшыя працы: партрэты Марыі Луізы дэ Тасіс, жывапісца П.Снаерса, серыя афортаў «Іканаграфія». Рэліг. кампазіцыям 1620-х г. уласціва пэўная аднастайнасць («Адпачынак на шляху ў Егіпет», «Мадонна дэль Разарыо», «Аплакванне Хрыста»). З 1632 у Лондане, прыдворны мастак Карла I. У творах таго часу («Карл I на паляванні», «Конны партрэт Карла I», «Дзеці Карла I», «Дж.Сцюарт, герцаг Рычмандскі», «Ф.Уортан») акцэнтаваў увагу на вытанчаным арыстакратызме вобразаў. Апошнім працам характэрна сухасць калярыту, стандартнасць.

А. ван Дэйк. Конны партрэт Карла I. Каля 1636.

ДЭЙЛ (Dale) Генры Халет (5.6.1875, Лондан — 22.7.1968), англійскі фізіёлаг і фармаколаг. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1914). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1898). З 1914 у Нац. ін-це мед. даследаванняў у Лондане (з 1928 дырэктар), у 1940—45 прэзідэнт Лонданскага каралеўскага т-ва, у 1942—46 дырэктар Каралеўскага ін-та Вялікабрытаніі (адначасова ў 1939—59 праф. фізіялогіі Лонданскага ун-та). Навук. працы па вызначэнні механізмаў перадачы нерв. імпульсу. Даследаваў хім. прыроду перадачы нерв. імпульсу праз сінапсы і ролю ў ёй ацэтылхаліну. Нобелеўская прэмія 1936 (разам з О.*Лёві*).

ДЭ́ЙМАС, спадарожнік планеты Марс. Адлегласць ад планеты 23,46 тыс. км. Мае няправільную форму, найб. папярочнік каля 16 км. Перыяд абарачэння вакол Марса 30 гадз 18 мін. Адкрыты А.Холам (1877, ЗША).

Г.Дэйл.

ДЭ́ЙМЕК (Dejmek) Казімеж (н. 17.5.1924, г. Ковель, Украіна), польскі акцёр і рэжысёр. У 1947 дэбютаваў як акцёр. У 1949—61 і 1975—79 дырэктар Новага т-ра (Лодзь), у 1962—68 — Нац. т-ра ў Варшаве. У 1969—71 працаваў за мяжой. У 1972—74 у Вялікім (Лодзь) і Драм. (Варшава) т-рах. З 1981 дырэктар Т-ра Польскага (Варшава). У 1993—95 міністр культуры і мастацтва Польшчы. Сярод пастановак: «Лазня» У.Маякоўскага (1954, 1983, г. Эсен, Германія), «Жыццё Іосіфа» М.Рэя (1958, 1965, 1985), «Кардыян» Ю.Славацкага (1965, 1967), «Намеснік» Р.Гохута (1966), «Аперэтка» В.Гамбровіча (1975), «Вызваленне» (1982) і «Вяселле» (1985, 1992) С.Выспянскага, «Амбасада» (1988) і «Партрэт» (1990) С. Мрожака. Ставіў оперныя спектаклі. Дзярж. прэмія Польшчы 1984.

ДЭЙР-ЭЛЬ-БА́ХРЫ, мясцовасць на зах. беразе Ніла ў Верхнім Егіпце насупраць г. Фівы, дзе паміж скаламі ўзведзены 2 пахавальныя храмы. Храм Ментухатэпа I, цара XI дынастыі (2050 да н.э.), складаўся з камернай грабніцы і піраміды, размяшчаўся ў дакладна спланаваным ансамблі з каланад і тэрас. Храм царыцы Хатшэпсут, XVIII дынастыі (1480 да н.э.) аналагічнай планіроўкі, але без піраміды; знакаміты сваімі рэльефамі, адзін з якіх выяўляе гандл. экспедыцыю ў *Пунт*.

ДЭ́ЙТАН (Dayton), горад на ПнУ ЗША, на р. Маямі, у штаце Агайо. Засн. ў 1796. 182 тыс. ж., з г. Спрынгфілд і агульнымі прыгарадамі каля 950 тыс. ж. (1990). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Буйны цэнтр машынабудавання: вытв-сць станкоў, інструментаў, кавальска-прэсавай і выліч. тэхнікі, авіяц. і ракетнага абсталявання, дэталей і вузлоў для аўтамабіляў, абсталявання для харч. і паліграф. прам-сці, электрабыт. прылад, рознай прамысл. тэхнікі. Развіта таксама металаапр., металургічная, папяровая, хім., паліграф. прам-сць. Перапрацоўка пластмас. 2 ун-ты. Даследчы цэнтр аэранаўтыкі і база ВПС ЗША Райт-Патэрсан. Музей авіяцыі.

ДЭЙТО́НА-БІЧ (Daytona Beach), прыморскі кліматычны курорт у ЗША. На ПдУ ад г. Джэксанвіл, на беразе Атлантычнага ак. Вельмі цёплы субтрапічны клімат з гарачым летам, сусветна вядомы пляж (37 км) са шчыльнага белага пяску, багатая расліннасць, іанізаванае паветра ствараюць умовы для адпачынку (асабліва зімовага) і лячэння многіх хвароб. Цэнтр паруснага спорту і турызму.

ДЭЙТРО́Н, стабільнае ядро атама цяжкага ізатопа вадароду (*дэйтэрыю*) з масавым лікам 2. Абазначаецца ^2H, D. Складаецца з пратона і нейтрона і з'яўляецца найпрасцейшай сістэмай, звязанай *ядзернымі сіламі*. Выкарыстоўваецца як мішэнь у многіх ядз. рэакцыях.

ДЭЙТЭРАМІЦЭ́ТЫ, тое, што *недасканалыя грыбы*.

ДЭЙТЭ́РЫЙ (лац. Deuterium), цяжкі вадарод, стабільны ізатоп вадароду з масавым лікам 2. Абазначаецца D, ^2H. Ядро атама (дэйтрон) складаецца з пратона і нейтрона. З кіслародам утварае цяжкую ваду. Выкарыстоўваецца як запавольнік нейтронаў у ядз. рэактарах, ядз. паліва.

Дэйцыя зграбная.

ДЭ́ЙЦЫЯ (Deutzia), род кветкавых раслін сям. гідрангіевых. Больш за 50 відаў. Пашыраны ва Усх. і Паўд.-Усх. Азіі, Паўн. Амерыцы (Мексіка). На Беларусі ў Цэнтр. бат. садзе АН інтрадукаваны 16 відаў, з іх для зялёнага будва рэкамендаваны Д. пышная (D. magnifica), пурпуровая (D. purpurascens) і шурпатая (D. scabra). Размнажаюцца насеннем і вегетатыўна.

Пераважна лістападныя кусты выш. да 2,5 м. Лісце простае, яйцападобнае, даўж. да 12 см, зубчастае, зверху ўкрытае зорчатымі валаскамі. Кветкі двухполыя, белыя, ружовыя або чырванаватыя, да 2 см у дыям., сабраныя ў шчыткі, гронкі або мяцёлкі, рэдка адзіночныя. Плод — шматнасенная шарападобная каробачка. У бат. садах і парках Беларусі трапляюцца таксама Д. зграбная (D. gracilis), драбнакветная (D. parviflora), Шнейдэра (D. schneideriana), Максімовіча (D. maximowicziana) і інш. Дэкар. расліны.

ДЭКА... (ад грэч. deka дзесяць), дзесятковая прыстаўка для ўтварэння найменняў кратных адзінак, роўных 10 зыходным адзінкам. Абазначаецца да. Напр., 1 дал (дэкалітр) = 10 л, 1 даг (дэкаграм) = 10 г.

ДЭКА́ДА [ад грэч. dekas (dekados) дзесятак], 1) прамежак часу ў дзесяць дзён; трэцяя частка месяца. 2) Грамадскія мерапрыемствы, прысвечаныя якой-н. падзеі, з'яве, якія праводзяць дзесяць дзён (напр., Д. бел. мастацтва і літаратуры).

ДЭКАДЭ́НЦТВА, дэкаданс (франц. décadence ад позналац. decadentia заняпад), агульная назва нерэалістычных кірункаў у мастацтве і літаратуры 2-й пал. 19 ст. — пач. 20 ст. (*імпрэсіянізму*, *сімвалізму*, эстэтызму і інш). Склалася пад уплывам адчування крызісу рэчаіснасці і свядомасці, няздольнасці чалавечага розуму асэнсаваць супярэчлівую рэальнасць, што прывяло да татальнага крызісу рацыяналізму і ўзмацнення ірацыянальных, містычных, інтуітывісцкіх элементаў у адлюстраванні свету і чалавека. Для яго характэрны настрой песімізму, адчуванне душэўнай і інтэлектуальнай стомленасці, заняпад духу, непрыняцце жыцця і адначасова абвостраная прага да жыццёвых радасцей — *геданізм*. Найб. моцна на фарміраванне Д. паўплывала метафізічная філасофія А.*Шапенгаўэра* і «філасофія жыцця» Ф.*Ніцшэ*. Прадстаўнікі Д. культывавалі падыход да мастацтва як да адзінага спосабу пазнання ісціны, пранікнення ў трансцэндэнтнае, адстойвалі самадастатковасць мастацтва, яго незалежнасць ад жыцця, культ генія і прыгажосці, непадуладных законам «цвярозага розуму» і абывацельскай маралі. Упершыню матывы Д. выявіліся ў творчасці франц. паэтаў Ш.Бадлера, Т.Гацье і інш., паэтаў парнаскай школы. Д. адлюстравала крызіс еўрап. грамадства, але яго нельга вызначыць як «заняпад мастацтва». Імкнучыся пераадолець духоўны крызіс, знайсці выйсце з лабірынта лёсу, абараніць чалавечае ў чалавеку, Д. выклікала да жыцця жывапіс франц. імпрэсіяністаў і англ. *прэрафаэлітаў*, паэзію П.Верлена, А.Рэмбо, С.Малармэ, С.Георге, Г. фон Гофмансталя, маладога Р.М.Рыльке, «тэатр маўчання» М.Метэрлінка, прозу О.Уайльда і інш. У Расіі Д. знайшло адлюстраванне ў творчасці сімвалістаў М.Мінскага, Д.Меражкоўскага, З.Гіпіус, К.Бальмонта, Ф.Салагуба і інш. сімвалістаў. Д. зрабіла істотны ўплыў на многіх майстроў рэалізму (А.Франс, Т.Ман, Л.Андрэеў), узбагаціла сродкі маст. выразнасці, многія з якіх сталі набыткам мадэрнісцкіх кірункаў у мастацтве (гл. *Мадэрнізм*).

Праблема Д. актыўна абмяркоўвалася ў бел. прэсе ў канцы 19 — пач. 20 ст. (газ. «Минский листок», «Северо-Западный край», «Наша ніва»). Дыскусіі адбываліся на фоне росту папулярнасці выяўленчых, тэатральных, літаратурных твораў майстроў зах.-еўрап. і рус. Д., якія ўваходзілі ў кантэкст культ. жыцця Беларусі таго часу. Эстэтыка Д., у т.л. сімвалізму і імпрэсіянізму, паўплывала на творчасць мастакоў Віцебскай школы (К.Малевіч, М.Шагал, Л.Лісіцкі, Р.Фальк, В.Ермалаева і інш.). Элементы сімвалізму ёсць у шэрагу прац мастака Я.Драздовіча (напр., карціны «Трызна мінуўшчыны», «Дух зямлі», «Брама будучыні», «Пагоня Ярылы»). Прыкметы Д. ў бел. л-ры парадаксальным чынам суадносяцца з адраджэнцкай тэматыкай твораў пісьменнікаў, што групаваліся вакол газеты «Наша ніва». У шэрагу твораў М.Багдановіча гучыць характэрны для Д. матыў трагічнай наканаванасці чалавечага існавання, збліжаюцца моманты нараджэння і смерці чалавека (цыкл вершаў «Каханне і смерць»). Багдановіч стаў першым перакладчыкам паэзіі Верлена на бел. мову (пераклаў 22 вершы). На творчасць Я.Купалы істотны ўплыў зрабілі дэкадэнты — Л.Андрэеў, А.Белы, Ф.Салагуб, С.Пшыбышэўскі, С.Выспянскі і інш. Драматычная паэма Я.Купалы «Адвечная песня» мае відавочныя рэмінісцэнцыі з п'есай Андрэева «Жыццё чалавека». Суб'ектывізм, паэтычны «шыфр», цьмяная сімволіка назіраюцца ў драм. паэме «Сон на кургане» і некаторых лір. вершах Я.Купалы. Містычны, ірацыянальны пачатак пры трактоўцы універсальных праблем жыцця, уласцівы эстэтыцы Д., можна назіраць у празаічных творах М.Гарэцкага («Патаёмнае», «Што яно?», «Страхащё»), «імпрэсіях» З.Бядулі, алегарычных апавяданнях Ядвігіна Ш., у філас. лірыцы А.Гаруна. Разам з тым Д. ў бел. л-ры пач. 20 ст. выступае не як адасобленая з'ява, а ў цесным узаемадзеянні з праявамі новага рамантызму, рэалізму.

П.В.Васючэнка (Д. на Беларусі), *Г.В.Сініла*.

ДЭКАЛІ́Н, дэкагідранафталін, бясколерная вадкасць. Існуюць 2 ізамеры з розным размяшчэннем цыклаў у прасторы: *транс*-Д. ($t_{кіп}$ 187,237 °С, шчыльн. 869,7 кг/м^3) і *цыс*-Д. ($t_{кіп}$ 195,774 °С, шчыльн. 896,7 кг/м^3). Не растворацца ў вадзе, добра растворацца ў метаноле і этаноле. Тэхн. (сумесь 60% цыс- і 40% транс-Д.) атрымліваюць каталітычным гідраваннем нафталіну. Выкарыстоўваюць як растваральнік тлушчу, гумы, каўчуку, сінт. смол, лакафарбавых матэрыялаў; растваральнік і стабілізатар крэмаў для абутку і воскаў для падлогі; заменнік жывіцы.



ДЭКАЛЬКАМА́НІЯ (франц. décalcomanie), паліграфічны спосаб вырабу пераводных відарысаў (дзіцячых малюнкаў, ярлыкоў і інш.), прызначаных для пераносу на тканіну, метал, фарфор, шкло, дрэва і інш. паверхні. Для друкавання відарысаў (у залежнасці ад метадаў іх пераносу) выкарыстоўваюцца водаўстойлівыя або тэрмапластычныя лакі і фарбы, спец. фарбы, выраблены на аснове смол. Друкуецца відарыс спосабам плоскага друку (*літаграфіяй*) на паперы са спец. пакрыццямі ці палімернай плёнцы, пад уздзеяннем вады, цяпла або ціску аддзяляецца ад падкладкі, на якой быў надрукаваны, і пераносіцца на патрэбную паверхню.

ДЭКАМПАЗЁР (ад франц. décomposer раствараць, драбіць), апарат для вылучэння крышталічнага гідраксіду алюмінію (гл. *Алюмінію злучэнні*) з раствору *алюмінатаў*.

Д. з мех. перамешваннем — стальны цыліндрычны чан (да 0,4 м^3), унутры якога круціцца ланцуговая мяшалка, каб падтрымліваць часціцы затраўкі (служаць цэнтрамі крышталізацыі) у завіслым стане. Д. з паветраным перамешваннем (умяшчальнасць да 3000 м^3) пашыраны ў выт-сці гліназёму (*алюмінію аксіду*). Д. злучаюцца паслядоўна ў секцыі (па 10—15 апаратаў), у галаўныя Д. бесперапынна падаецца затраўка, з хваставых адбіраецца гатовая гідратная пульпа. Выкарыстоўваюцца пераважна ў каляровай металургіі.

ДЭКАМПЕНСА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *кампенсацыя*), парушэнне дзейнасці органа, сістэмы органаў і арганізма ў цэлым з прычыны знясілення ці зрыву яго прыстасавальных механізмаў. Шкодныя ўздзеянні выклікаюць значныя змены ў арганізме і парушаюць раўнавагу паміж арганізмам і навакольным асяроддзем, што існуе пастаянна. Праз некат. час арганізм прыстасоўваецца да новых умоў існавання (напр., гіпертрафіруецца мышца сэрца пры яго пароках) і раўнавага аднаўляецца — настае *кампенсацыя*.

ДЭКАМПРЭСІ́ЙНЫЯ ХВАРО́БЫ, хваробы чалавека, абумоўленыя рэзкай зменай ціску навакольнага асяродзя. Узнікаюць у лётных экіпажаў пры працяглых палётах на выш. больш за 8 тыс. м, у вадалазаў і кесоншчыкаў (*кесонная хвароба*) пры апусканнях на значныя глыбіні. Адносяцца да *прафесійных хвароб*.

ДЭКА́Н (ад лац. decanus дзесятнік, першапачаткова — начальнік 10 салдат), 1) кіраўнік факультэта ў ВНУ. 2) У каталіцкай і англіканскай цэрквах — старэйшы свяшчэннік, які наглядае за групай прыходаў.

ДЭКА́Н, тое, што *Дэканскае пласкагор'е*.

ДЭКАНДО́ЛЬ (de Candolle) Агюстэн Пірам (4.2.1778, г. Жэнева, Швейцарыя — 9.9.1841), швейцарскі батанік; заснавальнік параўнальнай марфалогіі раслін. Замежны ганаровы чл. (1835) Пецярб. АН. Бацька А.*Дэкандоля*. Вучань Ж.*Кюўе* і Ж.Б.*Ламарка*. Праф. ун-таў у Парыжы (з 1802), Манпелье (з 1808), Жэневе (з 1816), дзе заснаваў бат. сад і «Гербарый Д.». Распрацаваў адну з першых натуральных сістэм раслін (1835); аўтар працы «Увядзенне ў натуральную сістэму царства раслін» (т. 1—17, 1824—39), якую завяршыў яго сын.

ДЭКАНДО́ЛЬ (de Candolle) Альфонс (27.10.1806, Парыж — 4.4.1893), швейцарскі батанік; заснавальнік гіст. навуказнаўства. Замежны чл.-кар. Пецярб. АН (1858). Сын А.П.*Дэкандоля*. Праф. (1835) і дырэктар Бат. сада Жэнеўскага ун-та (у 1835—49). Навук. працы па гіст. геаграфіі раслін і пытаннях пра паходжанне культ. раслін. Завяршыў выданне «Увядзення ў натуральную сістэму царства раслін» (т. 8—17, 1844—74), пачатую яго бацькам. Ініцыятар распрацоўкі Міжнар. кодэкса бат. наменклатуры.

ДЭКА́НСКАЕ ПЛАСКАГО́Р'Е, Дэкан (ад санскр. дакшына — поўдзень), пласкагор'е ў Індыі, унутр. ч. п-ва Індастан. Пл. каля 1 млн. км². Ступеньчатыя раўніны — паверхні выраўноўвання мезазойскага і палеагенанеагенавага ўзростаў (на выш. 1000—1500 м, 600—900 і 300—500 м) з латэрытнымі карамі магутнасцю да 100 м, над якімі ўзвышаюцца асобныя горы выш. 1000—2000 м і купалападобныя ўзгоркі. Частка *Індыйскай платформы*, складзена з Пн архейскіх і пратэразойскіх гнейсаў, крышт. сланцаў і кварцытаў, пранізаных гранітнымі інтрузіямі. На ПнЗ — базальтавае покрыва верхнемелавога і эацэнавага ўзростаў. Карысныя выкапні: жалеза, медзь, марганец, вальфрам, золата, каменны вугаль. Субэкватарыяльны мусонны клімат. Сярэдняя т-ра мая 29—32 °С, студз. 21—24 °С. Ападкаў 500—700 мм за год (пераважна летам). Рэкі Нармада, Маханады, Гадавары, Крышна, Каверы выкарыстоўваюцца ў асноўным для арашэння. Пераважныя тыпы глеб: чырвоныя латэрытныя, чырвона-бурыя, на трапах — чорныя трапічныя (рэгуры). На наветраных схілах — мусонныя лістападныя трапічныя лясы, у цэнтр. частцы — саванны і рэдкалессі.

ДЭКАПІ́РАВАННЕ (ад франц. décaper ачышчаць метал), выдаленне хім. або электрахім. спосабам найтанчэйшых плёнак аксідаў з паверхні метал. вырабаў. Пры Д. адбываецца лёгкае пратраўленне слоя металу, што садзейнічае добраму счапленню яго з гальванічным пакрыццём. Робіцца з дапамогай слабых растворaў сернай, салянай або азотнай кіслот, а таксама цыянідаў калію або натрыю перад аксідаваннем, пасіраваннем, нанясеннем гальванічных пакрыццяў. Выкарыстоўваюцца таксама перад халоднай штампоўкай стальных вырабаў, каб зняць акаліну з паверхні і павялічыць выцяжку.

ДЭКАПІТА́ЦЫЯ [ад *дэ...* + лац. caput (capitis) галава] у б і я л о г і і, абезгалоўліванне жывёл у доследах пры фізіял. і біяхім. даследаваннях; выдаленне месца росту сцябла ў раслін. У а к у ш э р с т в е — плодаразбуральная аперацыя пры запушчаным папярочным становішчы плода, якая мае на мэце аддзяленне галоўкі плода ад тулава ў вобласці шыі.

ДЭКАРАТЫ́ЎНАЕ МАСТА́ЦТВА, галіна пластычных мастацтваў, якая (як *архітэктура* і *дызайн*) служыць маст. фарміраванню матэрыяльнага асяроддзя, што ствараецца чалавекам і садзейнічае ўкараненню ў ім эстэт. і ідэйна-вобразнай асновы. Адзін са сродкаў эстэт. выхавання чалавека. Падзяляецца на *манументальна-дэкаратыўнае мастацтва* (уключае арх. *дэкор, дэкаратыўны жывапіс, дэкаратыўную скульптуру*), *дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, афармленчае мастацтва*. Творы Д.м. ствараюцца як элемент ці дэталь кампазіцыі і адыгрываюць істотную ролю ў аб'ёмна-прасторавай арганізацыі ансамбля. Ідэйна-вобразны змест твораў Д.м. найб. поўна раскрываецца пры ўспрыманні іх у тым ансамблі, для якога яны прызначаны.

ДЭКАРАТЫ́ЎНА-ПАКАЁВЫЯ САБА́КІ, п а к а ё в ы я с а б а к і, група выведзеных парод свойскіх сабак з арыгінальнымі вонкавымі формамі і канстытуцыяй, якіх гадуюць з эстэтычнымі і пазнавальнымі мэтамі. Як дэкар. трымаюць некат. *службовых сабак* і *паляўнічых сабак*, якія страцілі сваё першапачатковае прызначэнне. Асабліва папулярныя карлікавыя тэр'еры і пінчэры, *балонкі, пудзелі*, шпіцы, японскі хін і інш. На Беларусі з Д.-п. с. найб. гадуюць балонак, *сенбернара*, пекінскага сабаку, французскага бульдога, чау-чау, японскага хіна, некат. шпіцаў, пудзеляў, тэр'ераў, пінчэраў.

Ш п і ц ы (вялікі, карлікавы, вольфшпіц) выш. ў карку 27—50 см; поўсць пушыстая, густая, белая, чорная, шэрая, рыжая. Т э р ' е р ы (скотч- і скайтэр'ер) выш. ў карку 18—26 см; поўсць кароткая або доўгая чорная і карычневая з падпалінамі, шэрая, рыжая і інш.; хвост купіруецца. П і н ч э р ы (сярэдні і карлікавы) выш. ў карку 25—48 см; поўсць кароткая чорная з падпалінамі; купіруюцца хвост і вушы.

ДЭКАРАТЫ́ЎНА-ПРЫКЛАДНО́Е МАСТА́ЦТВА, творчасць па стварэнні маст. рэчаў, пераважна для побыту (посуд, мэбля, дробная пластыка, прылады працы, маст. тканіны, адзенне, ювелірныя вырабы і інш.); раздзел *дэкаратыўнага мастацтва*. Творы Д.-п.м. класіфікуюць паводле матэрыялу (метал, кераміка, цікло, косць, тэкстыль, дрэва) ці тэхнікі выканання (ліццё, чаканка,

Да арт. **Дэкаратыўна-пакаёвыя сабакі**: 1 — скотчтэр'ер; 2 — пекінес; 3 — карлікавы пінчэр; 4 — карлікавы шпіц.

коўка, разьба, інкрустацыя, размалёўка, ткацтва, пляценне, вышыўка). Д.-п.м. вырашае практычныя і маст. задачы, садзейнічае маст. арганізацыі прадметнага асяроддзя, якое адпавядае эстэт. запатрабаванням чалавека. Творы Д.-п.м. неаддзельныя ад матэр. культуры сучаснай ім эпохі, звязаны з яе звычаямі, этнічнымі і нац. асаблівасцямі, сац.-групавымі адрозненнямі. Эстэт. каштоўнасць вырабаў Д.-п.м., мэтазгоднасць і выразнасць форм дасягаюцца канстр. і пластычнымі магчымасцямі матэрыялу, разнастайнасцю прыёмаў яго апрацоўкі. Сродкі розных відаў выяўл. мастацтва (скульптуры, жывапісу, графікі) і арнамент выкарыстоўваюць у Д.-п.м. для стварэння дэкору і для формаўтварэння вырабаў (посуд у выглядзе расліны, жывёлы, чалавека, фігурныя дэталі мэблі і інш.). У прадметах утылітарнага характару дэкор можа адсутнічаць, эстэт. якасці дасягаюцца выразнасцю формы вырабу, што падкрэслівае яго прызначэнне. Адзінства маст. і утылітарнай функцый, формы і дэкору выяўляюць сінт. характар Д.-п.м.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Падвеска. 11 ст. Бронза.

Д.-п.м. ўзнікла на ранняй стадыі развіцця грамадства і на працягу стагоддзяў было адной з важных галін маст. творчасці, уласцівай усім народам. Найб. стараж. творы Д.-п.м. адлюстроўвалі разнастайныя ўяўленні чалавека пра сусвет і навакольнае асяроддзе, вызначаюцца ўвагай да эстэтыкі матэрыялу, змястоўнасцю вобразаў, рацыянальнасцю форм, падкрэсленых дэкорам. З узнікненнем класавага грамадства з'явіліся творы Д.-п.м., што адлюстроўвалі густы і ідэалогію пануючых класаў. Быт. мэтазгоднасць у іх часта адсутнічала, вылучаліся багацце матэрыялу і дэкору, апошні нярэдка станавіўся самамэтай і працюў сувязь з формай. Д.-п.м. кожнай гіст. эпохі развівалася ў агульным рэчышчы маст. стыляў, характэрных для інш. відаў мастацтва.

На тэр. Беларусі найб. стараж. ўзоры Д.-п.м. адносяцца да позняга палеаліту (каля 30 тыс. г. назад). У неаліце з пераходам да аселага жыцця мастацтва ўзнялося на больш высокую ступень. Знойдзены арнаментаваныя касцяныя вырабы, упрыгожанні з косці, бурштыну, дробныя пластычныя зааморфныя выявы з каменю, керамічны посуд, аздоблены наколкамі, нарэзкамі, грабеньчатым і ямкавым арнаментам. У канцы неаліту і ў бронзавым веку арнамент ускладніўся, пашырэнне набыла салярная сімволіка. Больш разнастайнымі сталі формы глінянага посуду, які аздабляўся арнаментам у выглядзе паскаў, ялінкавых узораў з насечак, пракрэсленых рысак. З адкрыццём выплаўкі медзі і бронзы пашырыліся метал. ўпрыгожанні. Разнастайнасцю вызначаецца Д.-п.м. жалезнага веку: гліняныя статуэткі жывёл, фібулы, скроневыя кольцы, пярсцёнкі, пацеркі, бранзалеты, вырабы з бісеру і інш. ўпрыгожанні, аздобленыя арнаментам, часам выемчатымі эмалямі. З падзелам грамадства на класы Д.-п.м. вылучылася ў самаст. галіну маст. дзейнасці. Майстры-рамеснікі, што працавалі ў гарадах і пры княжацкіх дварах, спецыялізаваліся ў асобных відах рамёстваў. Шырокае развіццё набылі разьба па косці, разьба па дрэве, *ліццё мастацкае, ювелірнае мастацтва*. Выраблялiся прадметы побыту, зброя, посуд, дробная пластыка (абразкі, шахматныя фігуркі), тканіны, абклады да кніг і абразоў, крыжы (гл. *Крыж Ефрасінні Полацкай*) і інш. Выкарыстанне ганчарнага круга спрыяла пашырэнню *ганчарства* і паляпшэнню якасці вырабаў. У аздаб-

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Люстра. 18 ст. Урэцкае шкло.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Фрагмент слуцкага пояса. 18 ст.

ленні твораў пераважаў тэраталагічны стыль, а таксама разнастайны арнамент геам. і расл. характару, звычайна гравіраваны. У 10—12 ст. Д.-п.м. развівалася ў агульным рэчышчы мастацтва Кіеўскай Русі, адчуваўся ўплыў Візантыі. У 14—16 ст. Д.-п.м. звязана з зах.-еўрап. мастацтвам, больш разнастайным стаў дэкор. У 15 ст. ўзніклі першыя рамесныя аб'яднанні — цэхі (цэх шкларобаў у Гродне), у якіх у 16 ст. канцэнтравалася асн. ч. рамеснікаў. Стварэнне цэхаў садзейнічала развіццю Д.-п.м., узбагачэнню асартыменту і дэкору вырабаў. Дасягнула росквіту ювелірнае мастацтва, развівалася шкларобства, ружэйная справа, выраб паліхромнай рэльефнай *кафлі* з геам., раслінными, геральдычнымі кампазіцыямі. У 17—18 ст. Д.-п.м. зазнала ўплыў барока, творы набылі дынамічную кампазіцыю, дэкар. пышнасць, пластычнасць і экспрэсіўнасць форм. Плоскасны характар дэкору саступіў месца аб'ёмнасці і шматпланавасці, шырока ўжываўся багаты раслінны арнамент у спалучэнні з дынамічна выгнутымі ракавінападобнымі элементамі, вітымі калонкамі, фігурнымі вывязамі і інш. Многія віды Д.-п.м. актыўна ўключаліся ў інтэр'ер, набылі манум.-дэкаратыўны характар. Пашырыліся *коўка мастацкая, чаканка*, рэльефная паліхромная кафля, росквіту дасягнула аб'ёмна-ажурная разьба (*беларуская рэзь*). Многія бел. майстры-ювеліры, разьбяры, цаніннікі, збройнікі працавалі ў Маск. дзяржаве. У 18 ст. ўзнікаюць мануфактуры шкларобчыя, ткацкія, фаянсавыя, а таксама жалеза- і медналіцейныя заводы. Вядомасць набылі *слуцкія паясы, карэліцкія шпалеры, урэцка-налібоцкае шкло*. Часта прадукцыя выраблялася паводле зах.-еўрап. узораў, але пад уплывам мясц. нар. мастацтва набывала своеасаблівую інтэрпрэтацыю: больш рэалістычна трактаваўся дэкор, уводзіліся элементы нар. мастацтва. У канцы 18 — пач. 19 ст. пад уплывам класіцызму характар Д.-п.м. стаў больш стрыманы, ураўнаважаны, у дэкор уключыліся выявы ант. матываў, ваен. атрыбутыкі, картушаў і інш. Масавае буд-ва ў гарадах выклікала пашырэнне маст. ліцця і кавальства ў архітэктуры. У 19 — пач. 20 ст. Д.-п.м. характарызуецца моцным узаемаўплывам 2 кірункаў: прамысл. і народнага. Ручныя цэхавыя і мануфактурныя рамёствы прыходзяць у заняпад, на базе мануфактур і нар. промыслаў узнікаюць прадпрыемствы маст. прамысловасці, што напаўнялі рынак таннай, але часта маламастацкай, эклектычнай прадукцыяй. Пашырэнне прамысл. прадукцыі адмоўна ўплывала на нар. маст. промыслы, некат. з іх заняпалі (напр., *набойка, пернікарства*). Адначасова развівалася традыц. *народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*, пашырыліся яго віды, звязаныя з аздабленнем нар. жылля. Развіццю яго садзейнічалі адкрытыя земствамі на аснове мясц. промыслаў рамесніцкія школы і майстэрні, дзе рыхтавалі кваліфікаваных спецыялістаў. Аднак у цэлым Д.-п.м. пач. 20 ст. перажывала крызіс, які паглыбіўся ў сувязі з 1-й сусв. вайной. Пошукамі новага стылю вызначаецца Д.-п.м. 1920-х г. У 1919 створаны спец. керамічныя майстэрні ў Віцебску і Магілёве, ткацка-вышывальная ў Слуцку, дрэваапрацоўчая ў Гомелі, пабудавана 1-я чарга Аршанскага льнокамбіната (1928—37). Аднак слабаразвітая прам-сць не магла задаволіць патрэбы насельніцтва ў зручных і прыгожых прадметах Д.-п.м., іх маст. ўзровень часта быў недастаткова высокі. Недахоп прамысл. маст. вырабаў часткова кампенсавалі творы *народных мастацкіх промыслаў*. Патрэбу ў керамічным посудзе гасп. і маст. прызначэння задавальнялі традыц. ганчарныя цэнтры: у Бабінавічах, Благаўцы, Гарадку, Гарадной, Дуброўне, Крэве, Міры, Копысі, Поразаве, Пружанах, Івянцы, Ракаве і інш. (гл. *Бабінавіцкая кераміка, Дубровенская кераміка* і г.д.). Нар. майстры аб'ядноўваліся ў арцелі, у 1938 арганізаваны Белмастпрамсаюз. Да канца 1940-х г. створана прамысл. база для развіцця Д.-п.м., адноўлены разбураныя ням.-фаш. захопнікамі прадпрыемствы маст. прам-сці. Пачалі працаваць Віцебскі дывановы камбінат (1946), Мінскі фаянсава-фарфоравы завод (1951), аднавілі работу Аршанскі льнокамбінат, шклозаводы ў Барысаве і Бярозаўцы (Лідскі р-н). Мастакі звярталіся да класічнай спадчыны, традыц. форм і дэкору. Аднак такое спалучэнне было часам эклектычнае, творы, асабліва выставачныя, вызначаліся залішняй пампезнасцю, складанасцю і надуманасцю форм, празмерным мех. выкарыстаннем арнаменту. З пач. 1960-х г. пашыраецца вытв-сць вырабаў Д.-п.м., прызначаных для штодзённага побыту. Барацьба супрацьлеглых тэндэнцый — эклектызму і спробаў стварэння новага стылю — характэрна для сучаснага Д.-п.м.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Флеты і келіх. Пач. 18 — 1-я чвэрць 19 ст. Шкло.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Царскія вароты. 18 ст. Саломапляценне.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Шафа. 18 ст. Разьба па дрэве.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. В.П р ы е ш к і н. Дэкаратыўнае пано «Жнівень». 1981. Шамот, глазура.

раць параднасці, састарэлых і нежыццёвых форм адыграла значную ролю ў абнаўленні і развіцці маст. прам-сці, пашырыла і зацвердзіла важнае значэнне Д.-п.м., але адначасова выклікала пашырэнне твораў занадта спрошчаных. У сярэдзіне 1960-х г. лаканізм саступае месца адлюстраванню сучаснасці, творчаму засваенню нац. традыцый, разнастайнасці і багаццю форм, каларыстыкі, дэкору. 1960—70-я г. — якасна новы перыяд у развіцці Д.-п.м. Пасля рэарганізацыі Белмастпрамсаюза ў ф-кі Упраўлення маст. прам-сці Мін-ва мясц. прам-сці БССР (1960) пашырыўся асартымент і тэматыка маст. вырабаў, павысілася іх якасць. Палепшылася і пашырылася вытв. база Д.-п.м.: рэарганізаваны вытв. цэхі Маст. фонду БССР, пачаўся выпуск прадукцыі на Брэсцкім дывановым камбінаце (1963—65), павялічаны магутнасці шклозавода «Нёман» і Барысаўскага хрусталёвага завода, Аршанскага льнокамбіната. Для падрыхтоўкі спецыялістаў адкрылася аддзяленне Д.-п.м. ў Бел. тэатр.-маст. ін-це (1961). Асн. прынцыпам Д.-п.м. становіцца прастата геам. форм, функцыянальнасць, строгасць, умелае выкарыстанне дэкар. уласцівасцей матэрыялу, яго натуральнай прыгажосці ў спалучэнні з разнастайнасцю і смеласцю дэкар. рашэнняў. Развіваюцца маст. шкло, фарфор, маст. кераміка, маст. тканіны. Д.-п.м. актыўна ўключаецца ў грамадскі інтэр'ер, набывае манум. характар (гл. *Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва*), у сувязі з гэтым развіваюцца новыя ці адраджаюцца забытыя яго віды: *габелен, коўка мастацкая*, чаканка. Майстры Д.-п.м. актыўна звяртаюцца да індывід. творчых вырашэнняў, новых відаў і жанраў. Дэманстрацыяй дасягненняў, праблем і тэндэнцый развіцця з'явілася рэсп. выстаўка Д.-п.м. «Гармонія і асяроддзе» (1986). Яна засведчыла прыкметны працэс станкавізацыі, часам нават адмовы ад прыкладной функцыі і імкненне да стварэння ўзораў скульптурна-пластычнага, жывапіснага, манум.-дэкар. характару. Многія майстры бяруцца за выра-

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Н.С у х а в е р х а в а. Габелен «Сонечны». 1983.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. Л.М я г к о в а. Кампазіцыя «Птушыны двор». 1980. Шкло.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. У.Ж о х а ў. Кампазіцыя «Сёння на світанні». 1985. Шкло.

Да арт. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**. М.Г а т а л ь с к і. Вазы з серыі «У пушчах Палесся». 1995.

шэнне агульначалавечых, філас. задач, падуладных раней толькі станковым відам мастацтва. Складанае становішча перажывае Д.-п.м. з канца 1980-х г. Спыніў дзейнасць Маст. фонд БССР, што пазбавіла прафесійнае Д.-п.м. экранам. базы, выключыла са сферы манум.-дэкар. мастацтва, вымусіла майстроў пераходзіць на стварэнне невял. рэчаў масавага побыту.

Літ.: Чекалов А.К. Основы понимания декоративно-прикладного искусства. М., 1962; Моран А. История декоративно-прикладного искусства от древнейших времен до наших дней: Пер. с фр. М., 1982; Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII—XVIII стст.: [Альбом]. Мн., 1984; Сахута Е.М., Говор В.А. Художественные ремесла и промыслы Белоруссии. Мн., 1988.

Я.М.Сахута.

ДЭКАРАТЫ́ЎНАЯ СКУЛЬПТУ́РА, скульптура, прызначаная для ўпрыгожвання інтэр'ераў, паркаў, плошчаў, вуліц, будынкаў; адзін са сродкаў эстэт. выхавання чалавека. Уключае *скульптуру малых форм, манументальна-дэкаратыўную скульптуру.* Удзельнічае ў маст. *тальны жывапіс* выконваецца ў выглядзе *мазаікі, пано, размалёўкі.*

ДЭКАРАТЫ́ЎНЫЯ ПТУ́ШКІ, птушкі, якіх трымаюць у няволі з эстэт. і пазнавальнымі мэтамі. Яны пераважна маюць яркую афарбоўку, прыгожа спяваюць або лётаюць; у няволі не траціць здольнасці да размнажэння. Радзіма большасці Д.п. — тропікі і субтропікі. На Беларусі найб. пашыраны *канарэйкі, папугаі, ткачы* і дэкар. галубы (паўліны, дутышы, якабіны, турманы, чайкі). Як дэкар. трымаюць таксама некат. птушак мясц. фауны: *аўсянак, берасцянак, валасянак, заранак, крыжадзюбаў, чыжоў, шчыглоў*, драздоў і інш.

ДЭКАРАТЫ́ЎНЫЯ РАСЛІ́НЫ, дрэвы, кусты і травяністыя расліны, якія выкарыстоўваюцца на азеляненне, упрыгожванне жылых памяшканняў і грамадскіх будынкаў. Д.р. ёсць сярод прадстаўнікоў *пакрытанасенных* і *голанасенных* раслін, *папарацей*. На Беларусі высаджваюць каля 30 відаў і форм мясц. дрэў і кустоў, з інтрадукаваных раслінамі (вінаград амурскі, хмель, кірказон, капрыфоль, дзявочы вінаград пяцілісточкавы і інш.), на кветніках садзяць ружы, цюльпаны, гладыёлусы, крокусы, касачы, флёксы, нарцысы, лілеі, астры і інш. У ахаваным грунце вырошчваюць пальмы, фікусы, гартэнзіі, цыкламены, герберы і інш. Сярод пакаёвых Д.р. найб. пашыраны пеларгонія, бягонія, плюшч, глаксінія, клівія, кактусы і інш.

ДЭКАРАТЫ́ЎНЫЯ СЛАІ́СТЫЯ ПЛА́СТЫКІ, палімерныя матэрыялы, якія складаюцца з асн. і дэкар. слаёў. Асн. слой вызначае мех. ўласцівасці матэрыялу, робіцца з гетынаксу, тэксталіту, шклотэксталіту, драўняных пластыкаў; звязвальнае рэчыва для асн. слоя — фенола-фармальдэгідныя смолы, поліэфіры, інш. палімеры. Дэкар. слой складаецца з паперы або баваўнянай тканіны (з малюнкам або аднафарбавай), прамочанай звычайна меламінафармальдэгіднай смалой. Выт-сць Д.с.п. уключае прамочку напаўняльніку, сушку, зборку пакета, прасавання або фармавання вырабаў складанай канфігурацыі, тэрмаапрацоўку гарачым паветрам або інфрачырв. прамянямі. Выкарыстоўваюцца на аддзелку мэблі, памяшканняў, салонаў трансп. сродкаў, на выраб карпусоў радыё- і тэлеапаратаў, магнітафонаў, халадзільнікаў і інш.

Дэкаратыўныя птушкі: 1 — канарэйка зялёная; 2 — канарэйка жоўтая; 3 — шчыгол; 4 — німфавы папугай; 5 — хвалісты папугайчык; 6 — чыж; 7 — лоры; 8 — жако; 9 — паўлін; 10 — якабін; 11 — дутыш; 12 — чайка; 13 — чорна-рабы турман.

Да арт. **Дэкаратыўныя расліны**. Азеляненне будынка дзявочым вінаградам.

ДЭКАРАЦЫ́ЙНАЕ МАСТА́ЦТВА, гл. *Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва.*

ДЭКАРА́ЦЫЯ (позналац. decoratio літар. ўпрыгожанне) у тэатры і кіно, афармленне трохмернай прасторы, у межах якой адбываецца дзеянне спектакля або фільма. Існуе для вобразнай характарыстыкі гіст. абставін, умоў і атмасферы спектакля або фільма — асяроддзя, у якім дзейнічае акцёр. Ствараецца з дапамогай архітэктуры, жывапісу, графікі, маст. планіроўкі месца дзеяння, спец. фактур, асвятлення і тэхнікі.

фарміраванні матэрыяльнага асяроддзя чалавека, уносіць у яго ідэйна-вобразны пачатак. Найб. поўна раскрывае свой змест у ансамблі, для эстэт. арганізацыі якога яна прызначана.

ДЭКАРАТЫ́ЎНЫ ЖЫВАПІС, жывапіс, які ўваходзіць у склад арх. збудавання ці твора дэкар.-прыкладнога мастацтва, не мае самастойнага ідэйна-вобразнага значэння і прызначаны для аздаблення або акцэнтавання канструкцыі ці функцыі прадмета. Як і *манументалін* — больш за 540 відаў і сартоў кветкавых раслін, каля 40 хвойных і лісцевых дрэў, 100 кустоў і больш дзесятка павойных раслін.

Пры падборы Д.р. зыходзяць з мясц. умоў і практыкі выкарыстання відаў раслін. Лінейныя пасадкі фарміруюць найчасцей з дрэў з правільнай кронай (елка, туя, клён, ліпа, бяроза і інш.), адзіночныя пасадкі або групы — з дрэў з вузкімі і шырокімі кронамі (арэх, клён, вяз, рабіна, дуб і інш.), па берагах вадаёмаў, на схілах высаджваюць з ніцай кронай — вербы і інш.; альтанкі, тэрасы, сцены будынкаў, балконы ўпрыгожваюць павойнымі

Сістэмы тэатр. Д.: кулісная перасоўная — мяккія навясныя кулісы або цвёрдыя на рухомых рамах, размешчаныя ад партала ўглыб сцэны (вядома з 1628); кулісна-арачная пад'ёмная — жывапісныя палотны, зробленыя з улікам перспектывы і сшытыя ў выглядзе арак (вядома з 17 ст.; разнавіднасць кулісна-арачнай Д. — ажурная, умацоўваецца на сеткі або апліцыруецца на цюлі); павільённая — сценкі-рамы, зацягнутыя маляваным палатном, перакрытыя столлю (з 1794); аб'ёмная — камбінацыя плоскіх сцен і аб'ёмных дэталей: станкоў, лесвіц, пандусаў і інш. (з 1870); для змены аб'ёмнай Д. ўжываюцца рухомыя пляцоўкі-фуркі, паваротны круг і інш.; праекцыйная Д. заснавана на праекцыі на экран статычных і дынамічных выяў — арх. і пейзажных матываў, дажджу, полымя і да т.п. (з 1908). Сярод прыёмаў — афармленне з ужываннем розных сістэм Д.: сімультантны (адначасовы паказ розных месцаў дзеяння), умоўны (афармленне ў нейтральных сукнах ці шырмах або ў іх спалучэнні з арх. і бытавымі дэталямі па рухомай Д. амінакіслот (кафермента з'яўляецца пераважна вытворнае вітаміну B_6 — пірыдаксальфасфат) удзельнічаюць ва ўтварэнні біягенных амінаў (гістаміну, сератаніну і інш.) у тканках жывёл. Сярод Д. кетакіслот (кафермент — тыямінпірафасфат) асабліва значэнне мае фермент піруватдэкарбаксілаза (гл. *Дэкарбаксіліраванне*).

ДЭКАРБАКСІЛІ́РАВАННЕ, адшчапленне дыаксіду вугляроду CO_2 ад карбаксільнай групы карбонавых к-т. Адрозніваюць ферментатыўнае і неферментатыўнае Д. Ферментатыўнае адбываецца пры ўздзеянні ферментаў *дэкарбаксілаз*, удзельнічае ў абмене рэчываў жывых арганізмаў. Асабліва значэнне маюць рэакцыі акісляльнага Д. пірувату з утварэннем ацэтылкафермента А і α-кетаглутаравай к-ты з утварэннем сукцынілкафермента А, Д. пірувату ў анаэробных умовах (браджэнне), Д. фосфаглюконавай к-ты ў пентозафасфатным цыкле, маланілкафермента А пры сінтэзе тлустых к-т і інш. Д. некат. амінакіслот у тканках жывёл і чалавека садзейнічае ўтварэнню біягенных амінаў і медыятараў (гістамін, сератанін, норадрэналін і інш.). Неферментатыўнае Д. можа быць пры награванні ці пад уплывам хім. рэактываў.

Да арт. **Дэкарацыя**. М.Апіёк. Эскіз дэкарацыі да спектакля «Варвары» М.Горкага. 1966.

Да арт. **Дэкарацыя**. П.Масленікаў. Эскіз дэкарацыі да оперы «Яснае світанне» А.Туранкова. 1958.

устаноўцы), прасторавы (сцэна з Д. акружае гледача з усіх бакоў). Кінадэкарацыі робяцца трохмерныя з улікам умоў здымкі (план, ракурс, асвятленне), характару здымкі і стужкі. Ім дадаюць жывапісную і фактурную апрацоўку: умоўна-абагульненую для агульных і аддаленых планаў і ілюзорна-натуральную для буйных і сярэдніх планаў. Д. ў кіно робяцца ў натуральную велічыню аб'екта або ў выглядзе яго фрагмента (т.зв. «ігравой часткі»). Фрагмент Д. часам дапаўняецца макетамі і рознымі фонамі, якія ў кадры злучаюцца ў адно цэлае. Развіццё мастацтва Д. цесна звязана з развіццём тэатра, кіно, драматургіі, выяўл. мастацтва. Актыўным творчым пошукам адметныя работы мастакоў тэатра і кіно М.Апіёка, М.Блішча, Б.Герлавана, А.Грыгар'янца, Я.Ждана, А.Марыкса, П.Масленікава, Дз.Мохава, С. і Я.Нікалаевых, Ю.Тура, Я.Чамадурава і інш. Гл. таксама *Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва*.

Літ.: Козлинский В.И., Фрезе Э.П. Художник и театр. М., 1975; Мастацтва беларускіх дэкаратараў. Мн., 1989.

Г.І.Барышаў.

ДЭКАРБАКСІЛА́ЗЫ, ферменты класа гідралаз, што каталізуюць рэакцыі дэкарбаксіліравання аміна- і кетакіслот.

ДЭКА́РТ (Descartes) Рэнэ (латынізаванае Картэзій; Renatus Cartesius; 31.3.1596, Ла-Э, цяпер г. Ла-Э-Дэкарт, Францыя — 11.2.1650), французскі філосаф, матэматык і прыродазнавец. Адукацыю атрымаў у езуіцкім калегіуме. З 1629 жыў у Нідэрландах, дзе выйшлі яго гал. творы — «Геаметрыя» і «Роздум аб метадзе» (абедзве 1637), «Разважанні аб першай філасофіі» (1641), «Пачаткі філасофіі» (1644), з 1649 у Стакгольме. У аснове філас. сістэмы Д. — дуалізм душы і цела, духоўнай і матэрыяльнай субстанцый, якія сталі асновай для разумення феномена т.зв. «гнасеалагічнага цвішэнізму» — стану паміж жыццём і смерцю, розумам і целам, логікай і страсцю, дабром і злом, бездухоўнасцю і маральнасцю, дэмакратыяй і дэспатызмам, свабодай і дэтэрмінацыяй і інш. Гал. і неад'емнай уласцівасцю матэрыі лічыў працягласць, або прастору, а гал. атрыбутам духоўнай субстанцыі — мысленне. З факта відавочнасці мыслення, або свядомасці чалавека, на думку Д., можна непасрэдна вывесці заключэнне пра сваё існаванне: «Я мыслю, значыць я існую». У гнасеалогіі Д. — пачынальнік *рацыяналізму*. Гал. ролю ў працэсе пазнання ён надаваў дэдукцыі, якая абапіраецца на цалкам відавочныя, інтуітыўна спасцігальныя аксіёмы. У матэматыцы ён — адзін са стваральнікаў аналітычнай геаметрыі, увёў літарныя абазначэнні, паняцці пераменнай велічыні і функцыі, сістэму каардынат; у механіцы сцвярджаў адноснасць руху і спакою, сфармуляваў агульныя законы дзеяння і процідзеяння, захавання пэўнай колькасці энергіі, даў паняцце імпульсу сілы; у касмалогіі выказаў ідэю натуральнага развіцця Сонечнай сістэмы і ўтварэння нябесных цел у выніку вікрападобнага руху часцінак матэрыі вакол цэнтра — Сонца (вікры Д.); у фізіялогіі раскрыў сутнасць адвольных і міжвольных рухаў і даў навук. апісанне рэфлектарнага акта (дуга Д.). Ідэі Д. сталі тэарэт. крыніцай *картэзіянства*, былі прадметам усебаковага даследавання і крытычнага аналізу Дж.Лока, Ж.Ламетры, І.Канта, Б.Спінозы і інш. Даследаванні Д. ў галіне матэматыкі і фармалізацыі працэсу пазнання разам з вынайдзенай Г.Лейбніцам дваічнай сістэмай злічэння пакладзены ў аснову тэорыі сучаснай выліч. тэхнікі і інфарматыкі.

На Беларусі філас., прыродазнаўчыя і гнесеалагічныя ідэі атрымалі шырокае распаўсюджанне ў 2-й пал. 18 ст. ва ўмовах пераадолення сярэдневяковай схаластыкі, пашырэння ідэалогіі *Асветніцтва*. Асн. элементы філас. сістэмы Д. ўключаліся ў праграмы лекцыйных курсаў па філасофіі, абмяркоўваліся ў навук. і перыядычных выданнях.

С.Шадурскі ў сваіх кнігах, выдадзеных у Навагрудку і Вільні, абвясціў Д. найвышэйшым навук. аўтарытэтам, падзяляў яго прынцыпы і пункт гледжання пра існаванне дзвюх субстанцый. У інтэрпрэтацыі А.Скарульскага рацыяналізм Д. і сфармуляваныя ім крытэрыі ісціны набылі тэалагічную афарбоўку. Крытыкавалася яго ідэя прыроджаных ідэй і інтуіцыўнай свядомасці. На дэдуктыўную рацыяналістычную логіку Д. спасылаўся Б.Дабшэвіч у сваіх разважаннях аб крытэрыі ісціны. Да механістычнай карціны свету, распрацаванай Д., схіляўся А.Доўгірд. У абарону ідэй Д. выступаў К.Нарбут, што сведчыць аб ломцы і

Р.Дэкарт.

Ш.Дэ Кастэр.

трансфармацыі айчыннай эклектыкі, пераходзе мысліцеляў Беларусі ад сярэдневяковага перыпатэтызму да філасофіі і навукі новага часу.

Тв.: Рус. пер. — Соч. Т. 1—2. М., 1989—94.

Літ.: Спиноза. Принципы философии Декарта. М., 1926; Лятжкер Я.А. Декарт. М., 1975; Матвиевская Г.П. Рене Декарт, 1596—1650. М., 1976; Памятники философской мысли Белоруссии XVII — первой половины XVIII в. Мн., 1991; Двенадцатые республиканские чтения «Великие преобразователи естествознания Декарт и Лейбниц»: Тез. докл. Мн., 1996.

С.Ф.Дубянецкі.

ДЭКА́РТАВА СІСТЭ́МА КААРДЫНА́Т, прамалінейная сістэма каардынат на плоскасці ці ў прасторы. Названа ў гонар Р.*Дэкарта*. Бывае прамавугольная (восі каардынат узаемна перпендыкулярныя) і касавугольная (вугал паміж каардынатнымі восямі адрозны ад прамога).

Прамавугольную Д.с.к. на плоскасці вызначаюць 2 каардынатныя восі — перпендыкулярныя прамыя, на кожнай з якіх пазначаны дадатны напрамак і зададзены адрэзак адзінкавай даўжыні ($OE_1=OE_2=1$). Пункт 0 іх перасячэння наз. пачаткам каардынат, вось Ox — воссю абсцыс, вось Oy — воссю каардынат. Прамавугольнымі дэкартавымі каардынатамі пункта M наз. ўпарадкаваная пара лікаў (x, y), вызначаных формуламі: $x=OM_x$, $y=OM_y$ (прамыя MM_x і MM_y паралельныя адпаведна восям Oy і Ox). У выпадку агульнай Д.с.к. (афінная сістэма каардынат) маштабныя адрэзкі на кожнай восі розныя ($OE_1 \neq OE_2$) і каардынатныя восі не перпендыкулярныя. Аналагічна вызначаецца Д.с.к. у прасторы (дадаецца вось аплікат Oz).

ДЭКА́РТАЎ ЛІСТ, плоская алгебраічная лінія 3-га парадку, якая ў прамавугольнай дэкартавай сістэме каардынат вызначана ўраўненнем $x^3+y^3-3axy=0$, $a>0$. Названы ў гонар Р.*Дэкарта*, які вывучаў пятлю крывой (1638). Поўная форма крывой з асімптотай, якая праходзіць праз пункты $(-a, 0)$ і $(0, -a)$, вызначана нідэрл. вучоным К.Гюйгенсам і швейц. вучоным І.Бернулі. Д.л. сіметрычны адносна бісектрысы $y=x$. У пачатку каардынат — *асаблівы пункт* (вузел) з датычнымі $x=0$; $y=0$. Ураўненне асімптоты Д.л. — $y=-x-a$. Плошча паміж Д.л. і асімптотай і плошча, абмежаваная пятлёй лініі, аднолькавыя і роўныя $S=3a^2/2$.



Дэкартаў ліст.

ДЭ КАСТЭ́Р (De Coster) Шарль (20.8.1827, г. Мюнхен, Германія — 7.5.1879), бельгійскі пісьменнік. Пісаў на франц. мове. Скончыў Брусельскі ун-т (1855). Першыя паэт. творы з'явіліся ў канцы 1840-х г. Аўтар зборнікаў «Фламандскія легенды» (1858), «Брабанцкія апавяданні» (1861), гіст. драмы «Стэфанія» (нап. 1853—55), псіхал. рамана «Вясельнае падарожжа» (1872), паэм, літ.-крытычных артыкулаў. Самы вядомы яго твор — «Легенда пра Уленшпігеля і Ламэ Гудзака, пра іх доблесныя, забаўныя і найслаўцейшыя справы ў Фландрыі і іншых землях» (1867). Прысвечаны падзеям Нідэрландскай бурж. рэвалюцыі 16 ст., нар. руху гезаў у барацьбе Фландрыі з Іспаніяй за сваю незалежнасць, гэты твор стаў своеасаблівай «нацыянальнай бібліяй Бельгіі». Выразныя рэаліст. тэндэнцыі спалучаюцца ў творы з элементамі рамантызму, глыбокі гістарызм, тыпізацыя — з фальклорнымі матывамі, мяккім лірызмам. У перакладзе на бел. мову раман выд. ў 1940. Бел. кампазітар Я.Глебаў паводле рамана напісаў музыку да балета «Тыль Уленшпігель» (паст. Бел. дзярж. т-рам оперы і балета ў 1974, 2-я рэд. 1978), а таксама сімф. паэму «Успаміны пра Тыля» (1977).

Тв.: Рус. пер. — Легенда об Уленшпигеле и Ламме Гудзаке... Мн., 1984; Фламандские легенды. М., 1975.

Літ.: Мицкевич Б.П. Шарль де Костер и становление реализма в бельгийской литературе. Мн., 1960.

Е.А.Лявонава.

ДЭКАТРО́Н [ад *дэка...* + (*элек*)*трон*], многаэлектродная *газаразрадная прылада* тлеючага разраду. Прызначаны для індыкацыі эл. імпульсаў у дзесятковай сістэме лічэння, падліку, камутацыі слабатокавых эл. ланцугоў і інш. Найб. хуткасць лічэння 10^5 імпульсаў за 1 с. Выкарыстоўваецца ў індыкатарных таблo лічбавых кантрольна-вымяральных прылад, вылічальных прыладах і інш.

Найб. пашыраная канструкцыя двухімпульснага Д. мае анод у выглядзе дыска з размеркаванымі вакол яго індыкатарнымі і кіроўнымі электродамі. Прынцып дзеяння Д. заснаваны на накіраваным пераносе (пераключэнні) кіроўнымі імпульсамі тлеючага разраду з аднаго электрода на другі.

ДЭКАЦІРО́ЎКА (ад франц. décatir знішчаць бляск), апрацоўка парай ці гарачай вадой шарсцяных і інш. тканін. Паляпшае іх якасць (ушчыльненне, павелічэнне мяккасці або пругкасці, бляску ці матавасці) і папярэджвае ўсадку пры пашыве і нашэнні. Робіцца ў т.зв. дэкацірах і ўсадачных машынах (забяспечваюць бесперапыннасць працэсу), звычайна перад фарбаваннем.

ДЭ КІ́РЫКА (De Chirico) Джорджа (10.7.1888, г. Волас, Грэцыя — 19.11.1978), італьянскі мастак і тэарэтык мастацтва; адзін з заснавальнікаў *метафізічнага жывапісу*. Вучыўся ў АМ у Афінах (да 1905) і Мюнхене (1906—09). Як мастак склаўся пад уплывам Г.Апалінэра, А.Бёкліна, П.Пікасо, ідэй класічнай антычнасці і міфалогіі, ням. філасофіі (Ф.Ніцшэ і інш.). У ранніх яго творах сімвалічнасць, адасобленасць свету ад чалавека, адлюстраванне ўяўнай звязанасці ва ўнутр. прасторы, асноўным персанажам якой быў манекен («Няўпэўненасць паэта», 1913; «Настальгія па бясконцасці», 1913—14; «Вялікая метафізіка», 1917). Пасля 1919 звяртаўся да класічных маст. прыёмаў і тэм, у метафізічную тэматыку ўводзіў сюррэалістычную сімволіку («Рымскія дамы», 1922).



Дэкартава сістэма каардынат: *а*, *б*, *в* — прамавугольная, касавугольная, афінная на плоскасці; *г* — прамавугольная ў прасторы.

У скульптуры ўвасабляў тыя ж іканаграфічныя матывы. Сярод літ. твораў «Hebdomeros» (1929), «Успаміны пра маё жыццё» (1945).

ДЭКЛАМА́ЦЫЯ (ад лац. declamatio практыкаванне ў красамоўстве), мастацтва выразна чытаць вершы ці прозу. Узнікла ў Стараж. Рыме як частка красамоўніцкага мастацтва. Прынятая ў 17—18 ст. класіцысцкім т-рам прыўзнятая, напеўная, умоўная Д. замянілася ў канцы 18 — пач. 19 ст. жыццёва праўдзівай, індывідуалізаванай мовай, якую ўвёў рамант. і асабліва рэаліст. т-р. Тэрмін Д. ўжываўся для вызначэння канцэртнага чытання вершаў з эстрады (пазней заменены тэрмінам *мастацкае чытанне*). Разнавіднасць эстраднай Д. — меладэкламацыя.

Д.Дэ Кірыка. Няўпэўненасць паэта. 1913.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ (ад лац. declaratio абвяшчэнне), 1) заява аднаго або некалькіх урадаў, паліт. партый, міжнар. або грамадскіх арг-цый, якія даводзяць да ўсеагульнага ведама праграмны акт, важную міжнар. падзею, закон і да т.п.; урачыстае абвяшчэнне агульнапаліт. прынцыпаў. 2) Заява падаткаплацельшчыка і некат. катэгорый дзярж. служачых пра характар і памер даходаў, маёмаснае становішча. 3) Дакумент, які прыкладаецца да грашовых і каштоўных пакетаў, што пасылаюцца поштай за межы краіны. 4) Заява мытні ад асобы, якая перасякае граніцу, пра наяўнасць і колькасць у яе рэчаў, каштоўнасцей, валюты і інш.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ АБ АБВЯШЧЭ́ННІ НЕЗАЛЕ́ЖНАСЦІ САВЕ́ЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЙ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, дзяржаўны і паліт. акт аб аднаўленні Беларускай ССР (2-м абвяшчэнні) на асновах, вызначаных у *Маніфесце Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі* 1.1.1919. Прынята 31.7.1920 на сумесным пасяджэнні Мінскага губ. ВРК з шэрагам паліт. партый і прафс. арг-цый Мінскай губ. Дэкларацыю падпісалі В.Г.Кнорын, А.Р.Чарвякоў і І.Т.Смілга [ад КП(б)Літбел], А.М.Крыніцкі (Бампі; праф. арг-цыі Мінскай губ.), У.М.Ігнатоўскі (Бел. камуніст. арг-цыя), А.І.Вайнштэйн (Бунд). Прыняцце Дэкларацыі было абумоўлена вызваленнем Беларусі ад польскіх акупантаў і фактычным скасаваннем *Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі*. У сувязі з міжнар. становішчам (мірны дагавор РСФСР з Літвой 12.7.1920; наступленне Чырв. Арміі на Варшаву і інш.) дэкларацыя не акрэслівала граніц Беларусі, а толькі сфармулявала прынцыпы, на аснове якіх павінна быць вызначана яе тэрыторыя. Да склікання з'езда Саветаў БССР уся ўлада ў рэспубліцы перадавалася *Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту БССР*, адмяняліся ўсе законы і пастановы польскай акупац. улады.

М.Ф.Шумейка.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ АБ ДЗЯРЖА́ЎНЫМ СУВЕРЭНІТЭ́ЦЕ БЕЛАРУ́СКАЙ САВЕ́ЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЙ РЭСПУ́БЛІКІ, акт урачыстага абвяшчэння суверэнітэту Беларусі. Прынята Вярх. Саветам БССР 27.7.1990. 25.8.1991 Дэкларацыі нададзены статус канстытуцыйнага закону. Складаецца з прэамбулы і артыкулаў. Беларусь абвешчана суверэннай дзяржавай, усталяванай на аснове права бел. нацыі на самавызначэнне, дзяржаўнасці бел. мовы, вяршэнства народа як носьбіта і адзінай крыніцы дзярж. улады. Мэты дзярж. суверэнітэту: свабоднае развіццё і дабрабыт, забеспячэнне правоў асобы, ператварэнне сваёй тэрыторыі ў бяз'ядзерную зону, а Беларусі ў нейтральную дзяржаву. Вызначэнне суверэнітэту абумовіла прыняцце прававых норм, якія замацавалі грамадзянства Беларусі, уласнасць бел. народа на зямлю, нетры, паветр. прастору, нац., культ. і гіст. каштоўнасці, непадзельнасць і недатыкальнасць тэрыторыі, права на стварэнне сваіх фін.-крэдытнай і грашовай сістэм, на ўласныя ўзбр. сілы, права заключаць добраахвотныя саюзы з інш. дзяржавамі і выходзіць з гэтых саюзаў.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ АБ'ЯДНА́НЫХ НА́ЦЫЙ, Вашынгтонская дэкларацыя. Падпісана ў Вашынгтоне 1.1.1942 прадстаўнікамі 26 дзяржаў (СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, Аўстраліі, Бельгіі, Гаіці, Гандураса, Гватэмалы, Грэцыі, Дамініканскай Рэспублікі, Індыі, Канады, Кітая, Коста-Рыкі, Кубы, Люксембурга, Нарвегіі, Нідэрландаў, Нікарагуа, Новай Зеландыі, Панамы, Паўднёва-Афрыканскага Саюза, Польшчы, Сальвадора, Чэхаславакіі і Югаславіі). Прынята ў развіццё *Атлантычнай хартыі 1941*. Прадугледжвала абавязацельствы бакоў (атрымалі назву *Аб'яднаных Нацый*) выкарыстаць усе свае ваен. і эканам. рэсурсы ў вайне супраць фаш. Германіі, яе саюзнікаў і сатэлітаў, узаемнае супрацоўніцтва краін *антыгітлераўскай кааліцыі*, незаключэнне імі сепаратнага перамір'я або міру з праціўнікам, далучэнне да Дэкларацыі інш. нацый, якія дапамагаюць або могуць дапамагчы ў барацьбе з фашызмам. З'явілася важным крокам у справе аб'яднання сіл антыгітлераўскай кааліцыі.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ НЕЗАЛЕ́ЖНАСЦІ 1776. Прынята 4.7.1776 у г. Філадэльфія 2-м Кантынент. кангрэсам прадстаўнікоў 13 англ. калоній у час *вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83*. Аўтарам яе праекта быў Т.*Джэферсан*. Абвясціла аддзяленне калоній ад метраполіі і ўтварэнне новай незалежнай дзяржавы — Злучаных Штатаў Амерыкі, роўнасць усіх каланістаў перад законам і іх неад'емныя правы на «жыццё, свабоду і імкненне да шчасця», прынцып нар. суверэнітэту як аснову дзярж. ладу і інш. Была першай у сусв. гісторыі дэкларацыяй правоў чалавека. Дзень 4 ліпеня з'яўляецца нац. святам ЗША.

Літ.: Война за независимость и образование США. М., 1976.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ ПРАВО́Ў ЧАЛАВЕ́КА, гл. *Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека*.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ ПРАВО́Ў ЧАЛАВЕ́КА І ГРАМАДЗЯНІ́НА, праграмны дакумент *Французскай рэвалюцыі 1789—99*. Прынята Устаноўчым сходам 26.8.1789. Зыходзіла з канцэпцыі нар. суверэнітэту і неад'емных натуральных правоў чалавека, якімі абвяшчаліся свабода асобы, слова, друку, сумлення, роўнасць грамадзян перад законам, іх правы на бяспеку, уласнасць і інш. У 1791 уключана ў франц. канстытуцыю як яе ўступная частка. Дэкларацыя зрабіла значны ўплыў на рэв. рух і паліт. думку краін Еўропы.

ДЭКО́ДЭР (ад *дэ...* + лац. codex звяздзенне), сістэмы каляровага тэлебачання, разнавіднасць *дэшыфратара*; прыстасаванне (блок) тэлевізара для дэкадзіравання відэасігналаў па алгарытме, адваротным кадзіраванні (гл. *Кодэр*). Бывае адна- (напр., Д. СЕКАМ) і шматсістэмны (напр., Д. ПАЛ/СЕКАМ). Атрыманыя на выхадзе сігналы яркасці і колеразнасныя сігналы падаюцца на кінескоп непасрэдна або пасля пераўтварэння ў сігналы асн. колераў.

ДЭКО́Р (франц. décor ад лац. decoro упрыгожваю), у архітэктуры, сістэма ўпрыгожвання фасадаў і інтэр'ераў будынкаў. Выступае ў адзінстве з аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй, падкрэслівае яе гал. элементы, надае пабудовам своеасаблівасць і выразнасць, садзейнічае аб'яднанню асобных будынкаў у арх. ансамбль. Можа быць просты (адналаровая афарбоўка сцен) ці складаны, які спалучае арх. элементы (абломы, ордэр, балконы і інш.) са скульптурай, рэльефам, размалёўкай і г.д. Вы-

значаецца таксама матэрыялам, яго фактурай, колерам.

У збудаваннях Беларусі 11—12 ст. Д. ствараўся выразнасцю муроўкі з плінфы (Сафійскі сабор у Полацку) і спалучэннем яе з часанымі ці паліраванымі камянямі і керамічнымі плітамі рознай формы (Барысаглебская царква ў Гродне). У гатычнай архітэктуры асн. тэма Д. — спалучэнне цаглянай муроўкі з атынкаванымі нішамі (*Мірскі замкава-паркавы комплекс, Сынковіцкая царква-крэпасць*). У будынках стылю барока і класіцызму выкарыстоўвалі формы антычнай ордэрнай сістэмы. Для барока характэрны складаныя пластычныя формы, крывалінейныя і разарваныя карнізы, лепка, скульптура, размалёўкі, паліваная кераміка (*Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс*, касцёл бернардзінцаў у Гродне). Д. класіцызму мае больш простыя формы фасадаў пры актыўным выкарыстанні ў інтэр'ерах жывапісу і лепкі (палацы ў Гомелі, Жылічах Кіраўскага р-на). Д. несапраўднай готыкі ўласціва шырокае выкарыстанне зубчатых завяршэнняў сцен, машыкуляў, стральчатых арак у аконных праёмах, нішах і інш. (палац у г.п. Косава, касцёл у в. Сар'я Верхнядзвінскага р-на). У Д. псеўдарускага стылю ўключалі *какошнікі, гіркі*, фігурныя калонкі і інш. (тэатр у Магілёве, сабор у Барысаве). Стыль мадэрн адметны выкарыстаннем арнаменту са стылізаваных дэкар. элементаў іншых арх. стыляў (будынкі пазямельна-сял. банкаў у Віцебску, Гродне). У драўляным нар. дойлідстве Д. складаюць маст. апрацоўка канструкцыйных элементаў (калон, падкосаў, кранштэйнаў і інш.) і разныя аздабленні іншых элементаў будынка: абрамленні акон і дзвярэй, шалёўка франтонаў, вуглоў, сцен і інш. (жылы дом у г.п. Чачэрск). У манум. драўляным дойлідстве 17—20 ст. выкарыстоўваліся матывы Д. каменных будынкаў (касцёл у в. Воўпа Ваўкавыскага р-на, Радзівілімонтаўскі палац у Клецкім р-не). У Д. сучасных будынкаў шырока выкарыстоўваюць абліцоўку сцен прыродным каменем, керамічнай і шклокерамічнай плітkай розных памераў, фактуру, колер, а таксама рэльефныя зборныя жалезабетонныя элементы; фасады ўпрыгожваюць творамі манум. мастацтва (тэатр муз. камедыі, гасцініца «Турыст», жылыя дамы ў мікрараёне «Усход» у Мінску). *С.А.Сергачоў.*

Да арт. **Дэкор** у архітэктуры. Аздабленне скразной разьбой ліштвы акна жылога дома ў г.п. Чачэрск.

Дэкор аздабленя жылога дома па вуліцы Савецкай у г. Гродна.

ДЭКРЭМЕ́НТ ЗАТУХА́ННЯ лагарыфмічны, натуральны лагарыфм адносін амплітуд ваганняў, узятых адпаведна праз прамежак часу, роўны перыяду ваганняў. Выражаецца формулай $\delta = \ln\frac{A(t)}{A(t+T)} = \gamma T$, дзе t — час, T — перыяд ваганняў, γ — каэфіцыент затухання. Прамежак часу t, за які амплітуда ваганняў памяншаецца ў e разоў, называецца часам рэлаксацыі: $t = \frac{T}{\delta} = \frac{1}{\gamma}$, пры гэтым адбываецца $N = \frac{1}{\delta}$ ваганняў. Для вагальнага контуру Д.з. роўны 0,02—0,05, для камертона 0,001, для аптычнага рэзанатара 10^{-7}—10^{-6}. Гл. таксама *Дыхтоўнасць вагальнай сістэмы, Затуханне ваганняў.*

ДЭКРЭ́Т (ад лац. decretum указ, пастанова), 1) урадавая пастанова, нарматыўны акт агульнага або прыватнага характару. Тэрмін узнік у Стараж. Рыме як пастанова сената, пазней — імператара. У ВКЛ Д. — пастановы вял. князя, паноў-рады, вышэйшай духоўнай улады, прыгаворы і рашэнні трыбунала, земскіх судоў па крымін. і цывільных справах, у Францыі — заканадаўчыя пастановы органаў улады, створаных у час рэвалюцыі 1789—99, Парыжскай камуны 1871. У СССР да прыняцця Канстытуцыі 1936 — назва найб. важных актаў вышэйшых органаў дзярж. улады і кіравання (напр., Д. аб зямлі, Д. аб міры). 2) У некат. сучасных краінах — нарматыўны акт, выдадзены кіраўніком дзяржавы ці ўрада. У выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь 1994 (са змяненнямі і дапаўненнямі), Прэзідэнт выдае Д., якія маюць сілу законаў. *Г.А.Маслыка.*

ДЭКРЭ́Т «АБ АБ'ЯДНА́ННІ САВЕ́ЦКІХ РЭСПУ́БЛІК: РАСІ́І, УКРАІ́НЫ, ЛА́ТВІІ, ЛІТВЫ́, БЕЛАРУ́СІ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ́ З СУСВЕ́ТНЫМ ІМПЕРЫЯЛІ́ЗМАМ». Прыняты па ініцыятыве ЦК РКП(б) і прапановах ЦВК Украіны, Савета абароны Літвы і Беларусі, урада Сав. Латвіі 1.6.1919 на пасяджэнні ВЦВК РСФСР з удзелам прадстаўнікоў Украіны, Беларусі, Латвіі і Літвы. Прызнаў за неабходнае са згоды ЦВК і СНК сав. рэспублік правесці аб'яднанне ваен. арг-цыі і ваен. камандавання, саветаў нар. гаспадаркі, чыг. ўпраўлення і гаспадаркі, фінансаў, камісарыятаў працы сав. рэспублік. Аформіў ваенна-паліт. саюз рэспублік, які дзейнічаў у гады грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі, быў этапам на шляху ўтварэння СССР.

ДЭКРЭ́ТНЫ ВО́ДПУСК, гл. *Водпуск па цяжарнасці і родах.*

ДЭКРЭ́ТНЫ ЧАС, зменены *паясны час* на 1 гадз уперад з мэтай больш рацыянальнага выкарыстання светлай часткі сутак. У СССР уведзены ў 1930. Д.ч. другога гадзіннага пояса лічыцца маскоўскім, апераджае сусветны час на 3 гадз. Парадак падліку Д.ч.: паясны час плюс 1 гадз. (пастаянна на працягу года) з дадатковым пераводам гадзіннай стрэлкі на 1 гадз уперад у летні час. Перавод адбываецца ўначы з апошняй суботы на нядзелю ў сакавіку і адпаведна на 1 гадз назад у кастрычніку. Тэр. Беларусі ўваходзіць у другі гадзінны пояс. За аснову Д.ч. ўзяты паясны, таму маскоўскі час апераджае беларускі на 1 гадз. Парадак пераводу гадзіннай стрэлкі ў летні час застаўся той самы.

ДЭКСТРА́Н, высокапалімерны поліцукрыд, які сінтэзуецца бактэрыямі роду Leuconostoc і блізкароднымі да іх з глюкозы ў асяроддзі з цукрозай. Мал. маса да $1 \cdot 10^6$ а.а.м. і больш. Структура малекулы лінейная або разгалінаваная. Сухі Д. набракае ў вадзе і электралітах (у малекуле шмат гідраксільных груп ОН-) з утварэннем вязкіх растворaў. Часткова гідралізаваны Д. ужываецца як кровазаменнік, папярочнасшыты — у гель-фільтрацыі.

ДЭКСТРЫ́НЫ, высокапалімерныя рэчывы поліцукрыднай прыроды, якія ўтвараюцца пры частковым гідролізе крухмалу і глікагену. Гідроліз бывае ферментатыўны (пры ўдзеле α- і β-амілаз) і неферментатыўны (пры ўздзеянні кіслот, шчолачаў, тэмпературы). На першай яго стадыі ўтвараюцца аміладэкстрыны (у прысутнасці ёду іх раствор набывае фіялетавы колер), потым эрытрадэкстрыны (утвараюць чырвонабуры колер з ёдам), затым ахраадэкстрыны (не афарбоўваюцца ёдам) і мальтадэкстрыны (не афарбоўваюцца і не выпадаюць у асадак пры дабаўленні спірту). Засвойваюцца арганізмам лепш, чым крухмал і глікаген. Д. з крухмалу — клеільныя рэчывы.

ДЭКУРЫЁНЫ [лац. decurio (decurionis)], 1) у Стараж. Рыме начальнік атрада (дэкурыі), які складаўся з 10 коннікаў. 2) Чл. гар. саветаў (сенатаў ці курый), якія спачатку існавалі ў залежных ад Рыма гар. абшчынах, пазней у час імперыі — ва ўсіх гарадах рым. правінцый. Камплектаваліся з былых гар. магістратараў. Пасада была пачэснай і пажыццёвай. 3) У 4 ст. да н.э. прывілеяванае саслоўе сярэдніх землеўладальнікаў. Д. займаліся размеркаваннем і зборам падаткаў, здачай у арэнду гар. зямель, распараджаліся гандл. упраўленнем, арганізоўвалі гульні і святкаванні. Дзейнасць Д. кантралявалі спец. куратары і

намеснікі правінцый. Эдыктамі імператара Канстанціна 316 і 325 да н.э. былі навечна замацаваны за месцам жыхарства з забаронай пакідаць гарады.

ДЭЛАВА́РЫ (саманазва л е н а п е), племя паўночнаамерыканскіх індзейцаў алганкінскай моўнай групы. У 17 ст. займалі тэр. сучасных штатаў ЗША Дэлавэр, Нью-Джэрсі, ч. штатаў Нью-Йорк і Пенсільванія. Займаліся паляўніцтвам, рыбалоўствам і земляробствам. Карысталіся *піктаграфічным пісьмом*, на якім была запісана легендарная гісторыя племя. Жывуць у ЗША (штаты Нью-Йорк, Вісконсін, Канзас, Аклахома; 3 тыс. чал., 1992) і ў Канадзе (рэзервацыі на Пд правінцыі Антарыо, 1 тыс. чал.). Вызнаюць пратэстантызм.

Д́ЭЛАВЭР (Delaware), рака на У ЗША. Даўж. 660 км, пл. бас. 31,1 тыс. км^2. Пачынаецца ў Апалачах, цячэ па плато Підмант і Прыатлантычнай нізіне, упадае ў заліў Дэлавэр Атлантычнага ак., утварае эстуарый. Сярэдні гадавы расход вады 350 м^3/с. Веснавое разводдзе, паводкі ў астатні час года. Суднаходная да г. Трэнтан, да г. Істан суднаходства па канале. Прылівы падымаюцца па рацэ на 210 км. На Д. — гарады Істан, Трэнтан, Філадэльфія, Уілмінгтан.

Д́ЭЛАВЭР (Delaware), заліў Атлантычнага ак., каля берагоў ЗША. Даўж. 80 км, шыр. ўваходу 18,5 км, у сярэдняй ч. каля 40 км. Замярзае ў суровыя зімы. Па дне заліва пракладзены суднаходны канал (глыб. 11,8 м) да вусця р. Дэлавэр, у раёне якога размяшчаюцца гарады Філадэльфія, Чэстэр і інш.

Д́ЭЛАВЭР (Delaware), штат на У ЗША, на ўзбярэжжы аднайменнага заліва Атлантычнага ак. Пл. 5,3 тыс. км^2. Нас. 700,3 тыс. чал. (1993), гарадскога 76,9%. Адм. ц. — г. Довер. Буйнейшы горад, прамысл. цэнтр і порт — Уілмінгтан. Паўн. ч. штата ўваходзіць у прыгарадную зону г. Філадэльфія. Штат займае ч. прыбярэжнай раўніны, найвышэйшы пункт 135 м. Клімат умераны, вільготны. Сярэдняя т-ра студз. каля -2 °С, ліп. каля 20 °С. Ападкаў за год каля 1100 мм. Лясоў мала. Вядучая галіна гаспадаркі — апрацоўчая прам-сць. Асн. галіны: хім. і нафтахім., нафтаперапр., гумавая, аўтамабіле-, судна- і прыладабудаванне, харч., тэкстыльная. У сельскай гаспадарцы пераважае жывёлагадоўля прыгараднага тыпу. 3 тыс. с.-г. ферм. Гал. галіна — птушкагадоўля (вытв-сць бройлераў). Гадуюць таксама буйн. раг. жывёлу, свіней. Марское рыбалоўства. Пашыраны пасевы соі, кукурузы, бульбы, пшаніцы. Агародніцтва і садоўніцтва. Транспарт марскі, аўтамаб., чыгуначны. Важную ролю адыгрывае суднаходны канал, які злучае залівы Дэлавэр і Чэсапікскі.

Да адкрыцця ў 1609 еўрап. экспедыцыяй Г.Гудзона тэр. Д. была заселена індзейскім племем *дэлавараў*. З 1631 тут пасяліліся галандцы, з 1638 — шведы, з 1664 — англічане. Д. быў ч. англ. калоніі Нью-Йорк, з 1682 — Пенсільваніі, у 1704 атрымаў абмежаваную аўтаномію. У 1776 у час *вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83* створаны штат Д. Адзін з 13 штатаў-заснавальнікаў ЗША, які ў 1787 першы ратыфікаваў федэральную канстытуцыю. У 1802 Э.І.Дзюпон дэ Немур заснаваў ва Уілмінгтане парахавы з-д, які ў 20 ст. ператварыўся ў сусветна вядомы хім. канцэрн «Дзюпон дэ Немур энд компані». Прымаў удзел у грамадз. вайне 1861—65 на баку Поўначы.

М.С.Вайтовіч (гаспадарка).

ДЭЛАГА́РДЗІ (De la Gardie), сям'я шведскіх ваен. і паліт. дзеячаў. П о н т у с (1520—5.11.1585). Француз па паходжанні. Барон, маршал (1582). Служыў у дацкім войску. У 1565 трапіў у шведскі палон і перайшоў на службу да караля Эрыка XIV, потым — Юхана III Вазы. З 1580 удзельнічаў у вайне з Расіяй, вёў мірныя перагаворы. Я к а б П о н т у с (20.6.1585, Талін — 12.8.1652), сын Понтуса. Граф (1615), маршал (1620). Удзельнік польск. і швед. інтэрвенцыі ў пач. 17 ст. ў Расію, заключэння *Сталбоўскага міру 1617*, вайны Швецыі з Рэччу Паспалітай 1617—29. З 1619 швед. намеснік у Рэвелі (цяпер Талін), з 1622 ген.-губернатар Ліфлянды. У 1632—44 чл. рэгенцкага савета пры непаўналетняй каралеве Крысціне. М а г н у с Г а б р ы э л ь (15.10.1622 — 26.4.1686), сын Якаба Понтуса. Граф, швагер (брат жонкі) Карла X Густава. Маршал і вял. канцлер (1660). Фаварыт каралевы Крысціны. У 1654—60 у вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 узначальваў швед. армію ў Інфлянтах, Літве і Беларусі. Вёў перагаворы пра заключэнне *Аліўскага міру 1660*. Садзейнічаў развязванню вайны з Прусіяй, якая скончылася ў 1675 паражэннем Швецыі. За няўмелае кіраўніцтва арміяй адхілены ад пасады.

ДЭЛАКРУА́ (Delacroix) Эжэн (26.4.1798, Сен-Марыс, каля Парыжа — 13.8.1863), французскі жывапісец і графік. Лідэр франц. *рамантызму*. Вучыўся ў П.Герэна (1816—22), зазнаў уплыў Т.Жэрыко. У Луўры вывучаў жывапіс старых майстроў (асабліва П.П.Рубенса), сучасны англ. жывапіс (Дж.Констэбл). Творам Д. ўласціва акрэсленая грамадзянская пазіцыя, жыццёвасць вобразаў, дынамічнасць кампазіцый, экспрэсіўнасць мазка, насычаны каларыт з кантрастамі светлаценяў і колеру. Карціна «Разня на Хіясе» (1823—24) — водгук на сучасныя яму падзеі: паказаў пакуты грэкаў пад тур. ярмом і выказаў пратэст супраць жорсткасці і гвалту. Звяртаўся да твораў У.Шэкспіра, І.В.Гётэ, В.Скота і інш. («Таса ў доме звар'яцелых», 1824; «Смерць Сарданапала», 1827; «Забойства епіскапа Льежскага», 1829). У 1830 пад уздзеяннем Ліпеньскай рэвалюцыі ў Францыі напісаў карціну «Свабода, якая вядзе народ» («Свабода на барыкадах»). Аўтар твораў на тэмы Франц. рэвалюцыі 1789—99 і нац. гісторыі («Бітва пры Пуацье», 1830, і інш.). Пасля паездак у Алжыр і Марока напісаў па замалёўках з натуры шэраг карцін, прасякнутых своеасаблівасцю нац. быту («Алжырскія жанчыны», 1833—34, «Яўрэйскае вяселле ў Марока», 1839). Пісаў партрэты (аўтапартрэт; 1829; «Ф.Шапэн», 1838, і інш.), працаваў у галіне манум. жывапісу (размалёўкі Бурбонскага палаца ў Парыжы, 1833—47, і інш.).

Літ.: Г а с т е в А.А. Делакруа. М., 1966; Д ь я к о в Л.А. Э.Делакруа. М., 1973.

ДЭЛА́МБР (Delambre) Жан Батыст Жазеф (19.9.1749, г. Ам'ен, Францыя — 19.8.1822), французскі астраном, геадэзіст і метролаг. Чл. Франц. (1791) і Пецярбургскай (1810) АН. У 1792—97 прымаў удзел у градусных вымярэннях дугі мерыдыяна ад г. Дзюнкерк (Францыя) да г. Барселона (Іспанія), што стала падставай для ўвядзення *метрычнай сістэмы мер*. Вылічыў табліцы бачных рухаў Сонца, вял. планет і спадарожнікаў Юпітэра. Аўтар працы па гісторыі астраноміі.

ДЭЛАНЭ́ (Delaunay) Рабер (12.4.1885, Парыж — 25.10.1941), французскі жывапісец і графік. Вучыўся ў Школе тэатр.-дэкарацыйнага мастацтва ў Бельвіле. Зазнаў уплывы *неаімпрэсіянізму*, П.*Сезана*, *кубізму*. Заснавальнік (з С.Тэрк-Дэланэ) плыні арфізм. Дынаміку руху і рытмаў перадаваў з дапамогай вылучаных ім заканамернасцей узаемапранікнення асн. колераў спектра і ўзаемаперасячэння крывалінейных паверхняў. Аўтар абстрактных карцін

(«Дыск», «Круглыя формы», 1912—13, «Даніна павагі Блерыо», 1914, «Радасць жыцця», 1930—31, «Рытмы», 1930—37), пейзажаў («Чырвоная Эйфелева вежа», 1910), лаканічных нацюрмортаў («Кафейнік, партугальскі нацюрморт», 1915—16), партрэтаў («Ф.Супо», 1922) і інш. Іл. глядзі ў артыкуле *Жывапіс*.

ДЭЛАРО́Ш (Delaroche) Поль (Іпаліт; 17.7.1797, Парыж — 4.11.1856), французскі жывапісец. Вучань А.*Гро*. Творы Д. («Дзеці Эдуарда IV», 1831; «Забойства герцага Гіза», 1834, і інш.) адлюстроўваюць драм. эпізоды гісторыі сярэдневякоўя. Ім уласціва натуралістычная тэндэнцыя (празаічна-павярхоўная трактоўка гіст. падзей, імкненне да дакладнай перадачы быт. дэталей), якая спалучаецца з займальнасцю рамант. сюжэтаў і ідэалізацыяй герояў. Аўтар размалёўкі ў Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы («Геміцыкл», 1837—41), шэрагу партрэтаў («Партрэт Генрыеты Зонтаг», 1831) і рэліг. кампазіцый.

П.Дэларош. Партрэт Генрыеты Зонтаг. 1831.

Э.Дэлакруа. Разня на Хіясе. 1823—24.

ДЭЛЕГАВА́НАЕ ЗАКАНАДА́ЎСТВА, выдадзеныя кіраўніком дзяржавы, урадам, іншымі дзярж. органамі па ўпаўнаважанні парламента нарматыўныя акты, якія маюць сілу закону ў парадку ўступкі (дэлегавання) парламентам заканад. паўнамоцтваў. Гэта звязана з ускладненнем кіраўніцкіх задач і неабходнасцю іх вырашэння на прафес. узроўні. Д.з. выкарыстоўваецца ў некат. развітых краінах свету, напр., Італія, Францыя, ФРГ і інш. У Рэспубліцы Беларусь рэалізуецца Прэзідэнтам краіны ў форме *дэкрэтаў*. Дэлегаванне заканад. паўнамоцтваў ажыццяўляецца на аснове Закону або палажэнняў Канстытуцыі, якія вызначаюць прадмет рэгулявання і тэрмін паўнамоцтваў. Існуе абмежаванне дэлегаваных паўнамоцтваў па пытаннях, якія адносяцца выключна да кампетэнцыі парламента. Формай Д.з. з'яўляецца таксама выданне парламентам т.зв. «рамачных законаў», у межах якіх выканаўчая ўлада можа ажыццяўляць праватворчасць. У шырокім сэнсе пад Д.з. разумеецца таксама перадача мясц. Саветамі дэпутатаў паводле дагавору некат. сваіх паўнамоцтваў органам тэр. грамадскага самакіравання.

В.А.Кадаўбовіч.

Г.Дэледа.

ДЭЛЕГА́Т (ад лац. delegatus пасланы, пасланец), выбарны або назначаны прадстаўнік, упаўнаважаны дзяржавы, арг-цыі, калектыву.

ДЭЛЕ́ДА (Deledda) Грацыя (27.9.1871, г. Нуора, Італія — 15.8.1936), італьянская пісьменніца. Творчасць Д. зазнала ўплыў натуралізму і верызму. Вобразы роднага вострава, псіхалогія яго жыхароў адлюстраваны ў першых раманах «Кветка Сардзініі» (1892), «Сумленныя душы» (1896) і інш. Вядомасць прынёс раман «Эліяс Партолу» (1903). Паступова ў творах Д. паглыбілася маральная праблематыка («Попел», 1904, «Плюшч», 1906, і інш.). Сярод лепшых раманаў: «Галубы і ястрабы» (1912), «Трыснёг пад ветрам» (1913), «Чужая віна» (1914), «Мар'яна Сірка» (1915), «Пажар у аліўкавым гаі» (1918), «Маці» (1920). У творах 1920-х г. адыход ад традыцый натуралізму і ўзмацненне сімволікі, распрацоўка характараў і паглыбленне лірызму (раманы «Сакрэт адзінокага чалавека», 1921, «Бог жывых», 1922, і інш.). У апошніх раманах, падзеі якіх адбываюцца ў кантынентальнай Італіі, узнімаюцца агульначалавечыя праблемы («Аналена Більзіні», 1927, і інш.). Нобелеўская прэмія 1926.

Тв.: Romanzi sardi. Milano, 1981; Рус. пер. — Свирель в лесу: Рассказы. М., 1967.

С.В.Логіш.

ДЭЛЕ́ЦЫЯ (ад лац. deletio знішчэнне), тып *храмасомнай перабудовы*, у выніку

якой выпадае ўнутр. ўчастак генет. матэрыялу. Плячо храмасомы з вял. Д. становіцца карацейшым, а сегмент, што выпаў, можа ўтварыць ацэнтрычнае кальцо, якое пры дзяленні клеткі знішчаецца (элімінуецца). Памеры Д. ад некалькіх нуклеатыдных пар да фрагментаў, што маюць некалькі генаў.

ДЭ́ЛІ, горад, сталіца Індыі і адм. ц. саюзнай тэр. Дэлі. Знаходзіцца на Пн краіны на р. Джамна (прыток р. Ганг), каля паўн.-ўсх. падножжа ўзгорыстай грады Аравалі. 7,2 млн. ж., з прыгарадамі 8,4 млн. ж. (1991). Складаецца са Старога Д. (Шахджаханабада, гіст. ядро горада), тэр. ваен. пасялення і Новага Д. (Нью-Дэлі з нас. 301,3 тыс. ж., 1993), які лічыцца афіц. сталіцай. Вузел 5 чыгунак і 11 аўтадарог. Міжнар. аэрапорт (Палам). Буйны прамысл., фін. і культ. цэнтр краіны. Развіты галіны прам-сці, што абслугоўваюць патрэбы сталіцы: тэкст. (баваўняная і шарсцяная тканіны), швейная, трыкат., хім., фармацэўтычная, гарбарна-абутковая, шклокерамічная, металаапр., паліграф., буд., некат. галіны машынабудавання (станкабудаванне, радыёэлектронная прам-сць). Маст. рамёствы (філігранныя сярэбраныя і залатыя ювелірныя вырабы, кераміка, разьбярства па слановай косці і камені, вырабы з папʼемашэ), саматужнае ткацтва. Цэнтр турызму. 4 ун-ты. Акадэмія музыкі, танца і драмы.

Паводле *«Махабхараты»* ў 1-м тыс. да н.э. горад быў рэзідэнцыяй царскай дынастыі Пандаваў і меў назву Індрапрастха. Сучасная назва з 736 пасля буд-ва на месцы стараж. гарадзішча г. Дхіліка (Дэлі). У 1206—1526 сталіца мусульман *Дэлійскага султаната*, з 1658 — імперыі *Вялікіх Маголаў*. У 1803 захоплены англічанамі, якія ў 1858 перанеслі сталіцу ў Калькуту. Адзін з цэнтраў *Індыйскага народнага паўстання 1857—59*. З 1911 сталіца Брыт. Індыі, з 1947 — дамініёна, з 1950 — Рэспублікі Індыя.

У Старым горадзе захаваліся гар. муры з брамамі (часткова), Саборная мячэць (1644—58), крэпасць Лал-Кіла (Чырвоны форт, 1639—48, з палацамі Ранг-Махал, Дывані-Ам, Дывані-Кхас, усе 1639—48, і Жамчужнай мячэццю, каля 1660). На Пд ад Старога горада — руіны г. Фіразабад (1351—88), палацава-крапасны ансамбль Пурана-Кіла (закладзены ў 1540; мячэці Кулан, 1380, і Кілаі-Кухна, 1545), маўзалей Хумаюна (2-я пал. 16 ст.). Прыкладна за 20 км на Пд ад Старога горада — 4 гарады-крэпасці: Сіры (будаваўся з 1303), Джаханпанах (14 ст.), Тутлакабад (1325; маўзалей Гіяс-ад-дзіна) і Лал-Кот (канец 12 ст.; жал. калона, 415; руіны мячэці Куват-уль-Ісламі, пачата ў 1193; мінарэт Кутб-Мінар, каля 1200—20; маўзалей Ільтутмыша, пасля 1235). Новы Д. — буйны раён з шэрагам плошчаў, паркаў і вуліц, якія радыяльна ад іх разыходзяцца. Уключае ансамбль урадавых будынкаў 1912—30-х г., «Браму Індыі» (помнік салдатам, якія загінулі ў сусв. войнах), нац. стадыён, абсерваторыю Джантар Мантар (1725), храм багіні Лакшмі Нараян (1938—39), мемар. музей М.Гандзі (канец 1960-х г., арх. А.Канвіндэ). Музеі: Нац. музей Індыі, нац. галерэя сучаснага мастацтва, Міжнар. музей лялек, мемар. музеі М.Гандзі, Дж.Нэру і інш.

Літ.: Короцкая А.А., Сапожников Б.Н. Дели. Л., 1983.

ДЭЛІ́Б (Delibes) Клеман Філібер Леа (21.2.1836, Сен-Жэрмен-дзю-Валь, цяпер у межах г. Ла-Флеш, Францыя — 16.1.1891), французскі кампазітар. Чл. Ін-та Францыі (1884). З 1848 вучыўся ў Парыжскай кансерваторыі ў А.*Адана* і інш. (з 1881 яе праф.). З 1853 акампаніятар «Тэатр лірык» і царк. арганіст у парыжскіх саборах, даваў урокі фп. У 1865—72 другі хормайстар т-ра «Гранд-Апера». Працаваў пераважна ў муз.-тэатр. жанрах. Найб. вядомыя яго оперы «Так сказаў кароль» (1873) і «Лакмэ» (1883) — адна з лепшых франц. арыентальных опер. Наватар у галіне балета, сімфанізаваў балетную музыку, развіў у ёй драм. пачатак. Яго лепшыя балеты «Капелія» (1870) і «Сільвія» (1876) зрабілі вял. ўплыў на развіццё муз.-харэаграфічнага мастацтва.

Літ.: Давидсон И. Балеты Делиба // Сов. музыка. 1961. № 2.

ДЭЛІ́БЕС (Delibes) Мігель (н. 17.10.1920, г. Вальядалід, Іспанія), іспанскі пісьменнік. Акад. (з 1975). Іспанскай рэчаіснасці 1940-х г. прысвечаны раманы «Кіпарыс кідае доўгі цень» (1947), «Пакуль яшчэ дзень» (1949). У сац.-псіхал. творах адлюстраваў трагічны лёс асобы ў свеце сучаснай цывілізацыі. Гораду Д. процістаўляе прыроду і поўнае цяжкасцей сялянскае жыццё, якое, на думку пісьменніка, з'яўляецца апорай чалавечнасці: аповесць «Дарога» (1950), раманы «Пацукі» (1962), «Пяць гадзін з Марыо» (1966), «Войны нашых бацькоў» (1975) і інш. Аўтар зб-каў апавяданняў «Сіеста пры паўднёвым ветры» (1957), дарожных нарысаў «Раманіст адкрывае Амерыку» (1956) і інш.

ДЭЛІ́ЙСКІ СУЛТАНА́Т, феадальная дзяржава ў Індыі ў 1206—1526. Засн. ў Паўн. Індыі пасля заваявання яе мусульм. дзяржавай *Гурыдаў* (канец 12 ст.). Заснавальнік — Кутб-ад-дзін Айбак, які абвясціў сябе султанам Паўн. Індыі. Сталіца — г. Дэлі. Д.с. быў феад. манархіяй, заваёўнікі і іх нашчадкі заснавалі дынастыі Гулямаў (13 ст.), Хільджы (13—14 ст.), Туглакідаў (14—15 ст.), Саідаў (15 ст.), Лодзі (15—16 ст.). Найб. магутнасці дасягнуў у часы *Алаад-дзіна Хільджы* [1296—1316]. На тэр. Д.с. дзярж. рэлігіяй стаў іслам, на важныя дзярж. пасады прызначалі мусульман, былі ўзведзены мусульм. культавыя будынкі. З сярэдзіны 14 ст. пачалося аслабленне Д.с. Пасля паходу *Цімура* на Індыю (1398—99) ад Д.с. адпалі Туджарат, Малва і інш. ўладанні. У 1526 заваяваны *Вялікімі Маголамі*.

ДЭЛІ́КТ (ад лац. delictum парушэнне, віна), правапарушэнне, незаконнае дзеянне, правіннасць, злачынства. У больш вузкім сэнсе — супярэчнае нормам цывільнага заканадаўства дзеянне, за якое прадугледжана пакаранне ў форме матэрыяльнай адказнасці.

ДЭЛІМІТА́ЦЫЯ ГРАНІ́Ц, вызначэнне становішча і напрамку дзярж. граніцы па дамоўленасці паміж сумежнымі дзяржавамі, зафіксаванае ў дагаворы і графічна выяўленае на картах, якія прыкладаюцца да яго. На падставе Д.г. праводзіцца *дэмаркацыя граніц*. Д. наз. таксама размежаванне марской тэр. сумежных дзяржаў (унутр. вод, тэр. мора,

Да арт. Дэлі. Брама ў Чырвоным форце.

Да арт. Дэлі. Храм багіні Лакшмі. Нараян. 1938—39.

выключнай эканам. зоны, кантынент. шэльфа), якое ажыццяўляецца на падставе міждзярж. дагавора або судовага ці арбітражнага рашэння.

ДЭЛІ́РЫЙ (ад лац. delirium вар'яцтва), трызненне, расстройства прытомнасці з галюцынацыямі пры інфекц. хваробах, атручэннях, алкагалізме, запаленнях мозга і інш.

ДЭЛО́Н (Delon) Ален (н. 8.11.1935, Парыж), французскі кінаакцёр, рэжысёр, прадзюсер. У кіно з 1957. У фільмах «Рока і яго браты», «Зацьменне», «Леапард», «Самурай», «Забойства Троцкага», «Месье Кляйн» раскрывае дваістасць чалавечай натуры сваіх герояў, канфлікт паміж матэрыяльным і духоўным. Знешні выгляд, пластычнасць, дынамізм зрабілі Д. папулярным у ролях розных амплуа. Паставіў фільм «За скуру паліцэйскага» (1981), «Неўтаймаваны» (1983). З 1968 выступае і як прадзюсер.

ДЭ-ЛО́НГ (De Long) Джордж Вашынгтон (22.8.1844, Нью-Йорк — 30.10.1881), амерыканскі палярны даследчык. Скончыў марскую Акадэмію ЗША (1865). Першае плаванне здзейсніў у Бафінаў зал. (1873). У 1879 узначаліў экспедыцыю на яхце «Жанета», мэтай якой было дасягненне Паўн. полюса і пошукі экспедыцыі Н.А.Нордэншэльда. На ПнУ ад в-ва Геральд яхта ўмерзла ў ільды; у час дрэйфу адкрыты а-вы Жанеты і Генрыеты. Пасля гібелі яхты ў чэрв. 1881 экіпаж дрэйфаваў на льдзіне, адкрыў в-аў Бенета. Д.-Л. з часткай спадарожнікаў, калі вызваліўся ад дрэйфу, дасягнуў вусця р. Лена, дзе загінуў ад голаду. Імем Д.-Л. названа група астравоў ва Усх.-Сіб. моры.

ДЭЛО́РМ (Delorme, de l'Orme) Філібер (паміж 1510—15, г. Ліён, Францыя — 8.1.1570), французскі архітэктар і тэарэтык архітэктуры эпохі Адраджэння. У 1533—36 у Рыме вывучаў ант. архітэктуру. З 1541 архітэктар караля. Работам уласціва спалучэнне ордэрных і гатычных элементаў: замак у Анэ 1543—55 (захаваўся часткова), грабніца Францыска I у царкве Сен-Дэні (Парыж, 1547), працы ў замках Фантэнбло (1548—54), Венсан (1558), Ле Мюэт (1550), шматлікія пабудовы ў Парыжы. Аўтар праекта замка Цюільры ў Парыжы (разбураны ў 1871). Увёў франц. калону (з дэкарыраванымі паясамі), «аркі Дэлорма» (драўляныя формы для перакрыцця вял. праёмаў). Аўтар тэарэт. прац «Новыя вынаходніцтвы для добрага ўмацавання гарадоў пры малых затратах» (1561), «Першы том архітэктуры Філібера Дэлорма» (1567), якія паспрыялі ўзнікненню класіцыстычнай плыні ў франц. архітэктуры.

ДЭЛО́СКІ САЮЗ, першы афінскі марскі саюз, аб'яднанне стараж.-грэч. полісаў узбярэжжа і а-воў Эгейскага м. Створаны каля 478 да н.э. пад гегемоніяй *Афін*. Узнік у перыяд *грэка-персідскіх войнаў* 500—449 да н.э. для барацьбы супраць перс. *Ахеменідаў дзяржавы*. Сходы саюза праходзілі на в-ве Дэлас (адсюль назва) у свяцілішчы Апалона, дзе да 454 да н.э. захоўвалася саюзная казна. Фармальна гэта быў саюз незалежных і раўнапраўных полісаў, але яго справы фактычна вялі афіняне. Паступова Д.с. ператварыўся ў Афінскую марскую дзяржаву. У эпоху росквіту ў яго ўваходзіла да 200 гарадоў. Спробы саюзнікаў выйсці з-пад афінскай апекі жорстка караліся. У *Пелапанескую вайну* 431—404 да н.э. пачаўся распад Д.с., у 404 пасля паражэння ў вайне па патрабаванні спартанцаў і іх саюзнікаў саюз распушчаны. Адноўлены ў 378—377 да н.э. як *Другі афінскі марскі саюз*.

ДЭЛФТ (Delft), горад на З Нідэрландаў, на канале Рэйн—Схі. Засн. ў 1075. Каля 100 тыс. ж. (1994). Старадаўні цэнтр вытв-сці керамічных вырабаў, т.зв. дэлфцкі фаянс. Прам-сць: металаапр. і маш.-буд. (кабель, металаканструкцыі, харч., хім., трансп. абсталяванне), аптычная, хім., харчовая. Маст. музеі, у т.л. гар. музей «Прынсенгоф» з карцінамі мастакоў дэлфцкай школы 17 ст. Шматлікія арх. помнікі 13—18 ст. Д. захаваў сярэдневяковы выгляд «воднага горада» з каналамі і цагляными дамамі 16—18 ст.

ДЭ́ЛЬБРУК (Delbrück) Бертальд (26.7.1842, г. Путбус, Германія — 3.1.1922), нямецкі лінгвіст. Вучыўся ў Гале і Берліне. Праф. санскрыту і кампаратывістыкі ў Іене (1870). Залажыў асновы вывучэння параўнальнага сінтаксісу індаеўрап. моў: «Сінтаксічныя даследаванні» (т. 1—5, 1871—88; з Э.Віндышам), «Асновы параўнальнай граматыкі індаеўрапейскіх моў» (т. 1—5, 1886—1900, з К.Бругманам). Вывучаў *веды*, выдаў «Ведыйскую хрэстаматыю» (1874). У працы «Асноўныя пытанні даследавання мовы» (1901) абараняў младаграматычную канцэпцыю мовы, ад якой пазней адышоў.

ДЭ́ЛЬБРУК (Delbrück) Ганс (11.11.1848, г. Берген, в-аў Руген, Германія — 14.7.1929), нямецкі ваен. гісторык і паліт. дзеяч. Праф. Берлінскага ун-та (1896—1921). Паслядоўнік Г. фон *Трайчке*. Вучыўся ў Гайдэльбергскім і Бонскім ун-тах. Чл. прускай палаты дэпутатаў (1882—85) і дэп. рэйхстага ад партыі свабодных кансерватараў (1884—90). У 1883—1919 рэдагаваў (да 1889 разам з Трайчке) орган кансерватараў Прусіі час. «Preußische Jahrbücher» («Прускія штогоднікі»). У 1-ю сусв. вайну выступаў за скасаванне сістэмы трохкласавага выбарчага права ў Прусіі на карысць дэмакр. канстытуцыйнай манархіі і інш. Гал. творы — «Гісторыя ваеннага майстэрства ў рамках палітычнай гісторыі» (т. 1—4, 1900—20; прадоўжана Э.Даніэльсам і О.Гайнцам, т. 5—7, 1926—36), «Сусветная гісторыя» (т. 1—5, 1923—28).

ДЭ́ЛЬБРУК (Delbrück) Макс (4.9.1906, Берлін — 9.3.1981), нямецка-амерыканскі фізік, генетык і вірусолаг, адзін з заснавальнікаў малекулярнай біялогіі. Чл. Нац. АН ЗША, Амер. АН і мастацтваў, Каралеўскай акадэміі Данii, АН Францыі, Лонданскага каралеўскага т-ва. Вывучаў фізіку ў Цюбінгенскім, Бонскім, Берлінскім і Гётынгенскім ун-тах. Доктарская ступень па фізіцы (1930). З 1937 у ЗША. У 1947—77 праф. Каліфарнійскага тэхнал. ун-та ў Пасадзене (у 1961—63 ва ун-це г. Кёльн). Навук. працы па атамнай фізіцы, мутагенезе, рэпрадукцыі вірусаў. Адкрыў феномен генет. рэкамбінацыі ў бактэрыяфагаў. Нобелеўская прэмія 1969 (разам з А.Д.*Хершы* і С.Э.*Лурыя*).

М.Дэльбрук.

ДЭ́ЛЬВІГ Антон Антонавіч (17.8.1798, Масква — 26.1.1831), рускі паэт, крытык, журналіст. Скончыў Царскасельскі ліцэй (1817), дзе зблізіўся з А.С.Пушкіным. Дэбютаваў одай «На ўзяцце Парыжа» (1814). Выдаваў альманах «Северные цветы» (1825—31) і з Пушкіным «Литературную газету» (1830—31). Аўтар зб. «Вершы барона Дэльвіга» (1829). Асн. жанры яго лірыкі — перайманні стараж.-грэч. паэтаў (ідыліі) і вершы ў духу рус. нар. песень, элегіі, рамансы, пасланні. Адзін з першых распрацаваў у рус. паэзіі форму санета. Некат. тэксты Д. пакладзены на музыку: «Салавей» (муз. А.Аляб'ева) і інш.

Тв.: Полн. собр. стихотворений. 2 изд. Л., 1959; Соч. Л., 1986.

Літ.: Рассадин С.Б. Спутники. М., 1983. С. 9—58.

ДЭЛЬКРЭ́ДЭРЭ (ад італьян. del credere напавер), у цывільным праве адна з умоў дагавору *камісіі*. Заключаецца ў прыняцці *камісіянерам* на сябе парукі за выкананне трэцяй асобай здзелкі, якая робіцца камісіянерам на карысць *камітэнта*. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь камісіянер, які прыняў Д., атрымлівае ад камітэнта асобнае ўзнагароджанне, памер якога вызначаецца пагадненнем бакоў, калі іншае не ўстаноўлена законам.

ры, Канстанцінопалі. Маючы славу знакамітага вучонага і медыка, у 1620 прыехаў у Вільню, некалькі гадоў быў лейб-медыкам Крыштафа Радзівіла. У 1628 выехаў у Амстэрдам. Памёр у Празе. Аўтар прац па філасофіі, яўр. л-ры, прыродазнаўчых навуках. Пакінуў нататкі пра сваё знаходжанне ў ВКЛ.

Н.К.Мазоўка.

ДЭЛЬ МО́НАКА (Del Monaco) Марыо (27.7.1915, г. Фларэнцыя, Італія — 16.10.1982), італьянскі спявак (драм. тэнар); буйнейшы прадстаўнік мастацтва *бельканта* сярэдзіны 20 ст. Вучыўся ў Пезарскай кансерваторыі. У 1943—73 на опернай сцэне, спяваў у лепшых т-рах свету («Ла Скала», «Ковент-Гардэн», «Метраполітэн-опера», Парыжская опера; у 1959 у спектаклях «Кармэн» Ж.Бізэ і «Паяцы» Р.Леанкавала ў Вял. т-ры ў Маскве). Валодаў голасам вял. дыяпазону з унікальным па насычанасці барытанальным тэмбрам, дакладным адчуваннем муз. стылю і фактуры вобраза, дарам свабоднага перавасаблення. Найб. вядомасць набыў у трагічных і гераіка-драм. партыях: Атэла, Радамес, Манрыка, Эрнані, Альвара («Атэла», «Аіда», «Трубадур», «Эрнані», «Сіла лёсу» Дж.Вердзі), Каварадосі («Тоска» Дж.Пучыні), дэ Грые («Манон Леско» Пучыні і «Манон» Ж.Маснэ), Турыду («Сельскі гонар» П.Масканьі), Паліён («Норма» В.Белініі). Здымаўся ў муз. фільмах («Джузепе Вердзі», 1953, і інш.).

Літ. тв.: Рус. пер. — Моя жизнь, мои успехи. М., 1987.

М.Дэль **Монака** ў ролі Атэла.

ДЭЛЬСА́РТ (Delsarte) Франсуа Аляксандр Нікала Шэры (19.12.1811, г. Салем, Францыя — 19.7.1871), французскі спявак (тэнар), тэарэтык і педагог вакала. Вучыўся ў Парыжскай кансерваторыі (1826—30). Напачатку выступаў у т-ры «Апера камік». Потым стаў хормайстрам парыжскага сабора абацтва Шатэль, пры якім адкрыў курсы спеваў, наладжваў т.зв. гіст. канцэрты, выконваў у іх творы франц. муз. класікаў. Распрацаваў тэорыю вак. майстэрства, важнае значэнне надаваў сродкам акцёрскай ігры, міміцы, жэсту. Аўтар метадычных твораў для голасу з фп.; вынайшаў апарат для кантролю за чысцінёй інтанавання. Яго тэорыі найб. пашырыліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. (асабліва ў ЗША) і ўплывалі на некалькі пакаленняў вак. педагогаў, выкарыстоўваліся і ў харэаграфіі (у прыватнасці, А.*Дункан*).

ДЭ́ЛЬТА (назва ад абрысу вял. літары грэч. алфавіта Δ дэльта), нізіна ў вусці ракі, складзеная рачнымі наносамі і парэзаная сеткай рукавоў і праток. Утвараецца ў выніку ўзаемадзеяння рачнога сцёку, хвалявання мора, прыліваў і згонна-нагонных цячэнняў, нарастае ад некалькіх метраў да соцень метраў за год. Адрозніваюць Д. трохвугольныя (р. Ніл), лопасцевыя (р. Місісіпі), дугападобныя (р. Лена), дзюбападобныя (р. Тыбр), запоўненыя (р. Кубань), высунутыя (р. Волга) і інш. Д. часта займаюць вял. плошчы (Амазонкі — 100 тыс. км^2, Волгі — 13 тыс. км^2).

Дэльтаплан у палёце.

ДЭЛЬТАПЛА́Н (ад *дэльта* + *план*), балансірны *планёр* з гнуткім (мяккім) крылом трохвугольнай (дэльта- або трапецападобнай) формы. Мае трубчасты каркас (звычайна з дзюралюмінію), тросавыя расцяжкі і нясучую паверхню — крыло (з дакрону або лаўсану). Выкарыстоўваецца ў *дэльтапланёрным спорце*.

Пілот прывязваецца да Д. рамянямі. Узлёт адбываецца ў выніку разбегу з высокага месца, кіраванне палётам — зменай пастаўлы цела з дапамогай ручкі-трапецыі. Абрыс Д. даў Леанарда да Вінчы, патэнт на Д. атрымаў Ф.Рагала ў 1951 (ЗША). Першыя палёты адбыліся ў канцы 1960 — пач. 1970-х г. у ЗША, Аўстраліі, СССР і інш. Створаны Д. «Славуціч» (Кіеў), «Сокал» (Ленінград), «Масквіч» (Масква) і інш. Найб. зафіксаваная працягласць палёту на Д. 28 гадз, далёкасць — каля 165 км (1979).

ДЭЛЬТАПЛАНЁРНЫ СПОРТ, від авіяц. спорту, падобны да планёрнага; выкананне планіруючых і лунаючых палётаў на прасцейшых лятальных апаратах. *Дэльтаплан* — просты па канструкцыі лятальны апарат масай да 35 кг. Старт робіцца са схілаў гор ці ўзвышша або з дапамогай буксіроўкі за катэрам ці аўтамабілем. Кіраванне ажыццяўляецца перамяшчэннем цэнтра цяжару спартсмена адносна канструкцыі. Палёты выконваюцца на скорасць або макс. далёкасць. Вопытныя спартсмены ў спрыяльных умовах пераадольваюць адлегласць у некалькі соцень км на выш. да 3 км. Д.с. узнік у ЗША (1973). Першы чэмпіянат Беларусі адбыўся ў 1977. Бел. федэрацыя звышлёгкай авіяцыі зарэгістравана ў 1995. На 1.1.1997 у Беларусі Д.с. займалася 150 чал., з іх 7 майстроў спорту. Як асобны кірунак інтэнсіўна развіваецца мотадэльтапланёрны спорт (дэльталётны).

Ф.Я.Пастушонак.

ДЭ́ЛЬТА-ФУ́НКЦЫЯ, δ-функцыя, δ-функцыя Дзірака, сімвал, што выкарыстоўваецца ў матэм. фізіцы пры рашэнні задач, у якія ўваходзяць засяроджаныя велічыні (маса, зарад, нагрузка і інш.). Абазначаецца $\delta(x)$.

Д.-ф. можна вызначыць як шчыльнасць размеркавання масы, калі ў пункце $x=0$ засяроджана адзінкавая маса, а ва ўсіх астатніх пунктах маса роўная нулю. Таму $\delta(x) = 0$ пры $x \neq 0$ і $\delta(x) = \infty$ пры $x=0$, прычым $\int_{-\infty}^{\infty} \delta(x)\,dx = 1$. Такім чынам, Д.-ф. можна разглядаць як бясконцы ўсплёск адзінкавай інтэнсіўнасці. Асн. ўласцівасць Д.-ф., што вынікае з гэтага вызначэння: $\int_{-\infty}^{\infty} f(x)\,\delta(x)\,dx = f(0)$, дзе $f(x)$ — кожная неперарыўная функцыя.

ДЭЛЬФІ́Н (лац. Delphinus), сузор'е Паўн. паўшар'я неба. Тры найб. яркія зоркі 3,7, 3,8 і 4 візуальнай *зорнай велічыні*. Назіраецца паблізу *Млечнага Шляху*. Найлепшыя ўмовы для назірання на тэр. Беларусі ў чэрвені—жніўні. Гл. *Зорнае неба*.



Сузор'е **Дэльфін**.

ДЭЛЬФІ́Н у спорце, спосаб спарт. плавання, скорасная разнавіднасць батэрфляю, ад якога адрозніваецца хвалепадобным рухам ног і цела.

ДЭЛЬФІ́НЫ, млекакормячыя 2 сям.: рачных, або прэснаводных, Д. (Platanistidae) і дэльфінавых (Delphinidae) атр. кітападобных. 24 роды, 53 віды. Рачныя Д. пашыраны ў трапічных рэках Паўд. Амерыкі, уздоўж Атл. ўзбярэжжа ад Бразіліі да Цэнтр. Аргенціны, рэках Індыі і Кітая, дэльфінавыя — амаль ва ўсіх морах. Найб. вядомыя Д. з родаў *афаліны*, *касаткі*, белабочкі, марскія свінні і інш. У Чырв. кнізе МСАП 3 віды Д.: азёрны (Lipotes vexillifer), індскі (Platanista minor-P. indi), каліфарнійская марская свіння (Phocoena sinus).

Даўж. цела 1—10 м, маса да 8 т. У большасці ёсць спінны плаўнік, морда выцягнута ў «дзюбу», зубы шматлікія (больш за 70). Хваставы плаўнік гарызантальны, двухлопасцевы. Скура голая, рознага колеру. Д. добра арыентуюцца ў вадзе з дапамогай эхалакацыі і слыху (успрымаюць ваганні ад некалькіх дзесяткаў Гц да 200 кГц). Маюць складаную галасавую сігналізацыю і гукасігнальны (эхалакацыйны) орган, добра развіта ц.н.с.: галаўны мозг вялікі, шарападобны, вял. паўшар'і са шматлікімі звілінамі. Палавая спеласць у 3—5 гадоў. Нараджаюць 1 дзіцяня. Кормяцца рыбай, галаваногімі малюскамі, ракападобнымі. Здольныя да гукапераймання. Аб'екты спец. даследаванняў. Лёгка дрэсіруюцца, утрымліваюцца ў акіянарыумах (дэльфінарыях), дзе могуць размнажацца. Некат. віды прамысловыя.

ДЭ́ЛЬФЫ (грэч. Delphoi), старажытны горад у Грэцыі каля падножжа гары Парнас у паўд.-зах. Факідзе. Буйны рэліг. цэнтр з храмам і аракулам бога Апалона. У 7—6 ст. да н.э. Д. набылі ролю агульнагрэч. свяцілішча. З 582 да н.э. ў іх праходзілі агульнагрэч. піфійскія гульні, на час якіх усталёўвалася свяшчэннае перамір'е. З дароў Апалону ў Д. назапасіліся вял. скарбы і горад стаў буйным крэдытна-пазыковым цэнтрам. У 279 да н.э. Д. спустошаны галамі, у 189 да н.э. захоплены рымлянамі, у 86 да н.э. абрабаваны *Сулам*, які вывез адсюль творы мастацтва. Пасля дэкрэта рым. імператара Феадосія I аб закрыцці храма (391 н.э.) горад паступова заняпаў. Цяпер Д. — невял. населены пункт.

З горным рэльефам гарманічна спалучаюцца помнікі Д., адкрытыя раскопкамі з 1892: храм Апалона Піфейскага (6 ст. да н.э., перабудаваны ў 4 ст. да н.э., арх. Ксенадор і Агатан), скарбніцы сіфнійцаў (каля 525 да н.э.), афінян (480 да н.э.) і інш., стоя (галерэя-порцік) афінян (475 да н.э.), выбіты ў скале т-р на 5 тыс. гледачоў (4 ст. да н.э.) — на свяшчэнным участку Апалона. Фундаменты старога (канец 7 ст. да н.э.) і новага (канец 6 ст. да н.э.) храмаў Афіны Пранаі, круглая ў плане грабніца — фалос (пач. 4 ст. да н.э.) — на свяшчэнным участку Афіны. Стадыён (каля 460 да н.э.), гімнасій (334—327 да н.э.), басейн Кастальскай крыніцы (7 ст. да н.э.). Арх. музей (каштоўныя зборы ант. мастацтва — надпісы, скульптуры, у т.л. бронзавая статуя возніка, рэльефы і інш.).

ДЭЛЮ́ВІЙ (ад лац. deluo змываю), адклады, якія ўзніклі на схілах у выніку намнажэння змытых дажджавымі патокамі часцей, злучэнняў і ўстаноў. 3) Звальненне з узбр. сіл ваеннаслужачых пасля сканчэння тэрміну ваен. службы. 4) Пераносна — аслабленне гатоўнасці, актыўнасці, пільнасці, насцярожанасці.

Дэльфіны: 1 — белабочка; 2 — белабокі; 3 — маршчыністазубы; 4 — ціхаакіянскі кароткагаловы; 5 — белакрылая марская свіння; 6 — грында.

ДЭМАВЕ́НД, патухлы вулкан у гарах Эльбурс, на Пн Іранскага нагор'я. Выш. 5604 м (найвыш. вяршыня Ірана). Складзены з андэзітавых лаў, знаходзіцца ў стадыі сольфатары (выхады гарачых газаў, тэрмальныя крыніцы). Ледавікі.

ДЭМАГО́Г (грэч. dēmagōgos літар. правадыр народа), у Старажытнай Грэцыі, асабліва ў Афінах, кіраўнік паліт. групоўкі дэмакр. кірунку, які вёў за сабой народ. У канцы 5—4 ст. да н.э. тэрмін «Д.» набыў адмоўны сэнс і стаў абазначаць паліт. дзеяча, які імкнецца здабыць сабе папулярнасць шляхам падману і хлусні.

«ДЭМАГРАФІ́ЧНЫ ВЫ́БУХ», рэзкае паскарэнне тэмпаў росту насельніцтва ў 1950—60-х г. у краінах Азіі, Афрыкі і Лац. Амерыкі, якія пачалі хутка развівацца. Абумоўлены зніжэннем смяротнасці, асабліва дзіцячай, пры захаванні высокай нараджальнасці. Апераджальны рост насельніцтва краін, якія развіваюцца (у іх пражывае больш за 50% насельніцтва свету), ператварыла «Д.в.» у гэтых краінах у фактар сусветнага значэння, а сац.-эканам. праблемы іх развіцця прынялі характар *глабальных праблем* чалавецтва.



Да арт. **Дэльфы**. Храм Апалона Піфейскага.

ДЭМАГРА́ФІЯ (ад грэч. dēmos народ + ...*графія*), навука аб *народанасельніцтве* і

заканамернасцях яго развіцця. Па матэрыялах статыстыкі вывучае: рух і развіццё насельніцтва (нараджальнасць, смяротнасць, прырост, міграцыйныя працэсы, прагноз яго колькасці, складу, размеркавання, шлюбнасць, сям'ю, дзярж. і грамадскія ступені ўплыву на дэмаграфічныя працэсы); насельніцтва і эканам. развіццё (суадносіны эканам. і дэмаграфічнага росту, праблемы і крытэрыі занятасці, дэмаграфічныя праблемы выкарыстання прац. рэсурсаў, іх прафес. і кваліфікацыйны склад, эканам. ўмовы развіцця і ўзнаўлення насельніцтва); насельніцтва і прыродныя рэсурсы і інш. Падзяляецца на дэскрыптную (апісвае насельніцтва на аснове стат. звестак), эканамічную і сацыяльную (даследуе сувязі паміж дэмаграфічнымі, эканам. і сац. працэсамі), гістарычную (гісторыя развіцця народанасельніцтва), матэматычную (апісвае дэмаграфічныя працэсы і структуры з дапамогай матэм. мовы), патэнцыяльную (агульную колькасць чалавека-гадоў, якія належыць пражыць людзям, што ўваходзяць у пэўную сукупнасць), вайсковую (вайсковы патэнцыял краіны ў сувязі з эканам. і тэхн. патэнцыялам, яго выкарыстанне ў мірны і ваен. час) і інш. Цесна звязана з этнаграфіяй, экалогіяй, біяметрыяй, генетыкай народанасельніцтва і інш. Праз метады стат., матэм. і ўласна дэмаграфічныя Д. распрацоўвае тэорыю ўзнаўлення насельніцтва, дэмаграфічныя прагнозы, абгрунтоўвае дэмаграфічную палітыку. Найб. поўнай крыніцай інфармацыі з'яўляецца перапіс насельніцтва.

Пачынальнікам навукі Д. лічыцца Дж. Граўнт (1620—74). Вялікі ўклад у развіццё Д. зрабілі англ. (У.Пеці, Т.Р.Мальтус, Г.Спенсер), ням. (І.П.Зюсмільх, В.Лексіс, Г.Ф.Кнап, Р.Р.Кучынскі), франц. (А.Дэпарсьё, Ж.Бертыльён), амер. (Р.Пірл, А.Дж.Лотка), галанд. (В.Керсебом), швед. (П.В.Варгенцін), белг. (А.Кетле), рас. (Д.Бернулі, М.В.Ламаносаў, Л.Эйлер, І.Ф.Герман, К.Ф.Герман, В.І.Грабеншчыкоў, В.Я.Бунякоўскі, Г.В.Пляханаў, М.В.Птуха, С.А.Навасельскі) вучоныя.

На Беларусі дэмаграфічныя даследаванні пачаліся ў 1880-я г. (праводзілі медыкі-гігіеністы Л.І.Галынец, А.А.Бекарэвіч, В.В.Кошалеў, С.М.Урванцоў). У савецкі час аналізаваліся матэрыялы перапісаў 1923 і 1926, натуральны рух насельніцтва, асаблівасці яго ўзнаўлення, пытанні сям'і і шлюбу і інш. (С.Слупскі, Д.М.Паслаўскі, С.Я.Вальфсон, Б.Я.Смулевіч). У 1960—70-я г. гал. цэнтрам вывучэння дэмаграфічных пытанняў стаў НДІ эканомікі і эканомікаматэм. метадаў планавання пры Дзяржплане БССР. Дэмаграфічнымі пытаннямі займаюцца Камітэты па народанасельніцтве і міграцыі; міграцыйная служба, НДІ і аддзелы дэмаграфіі пры Мін-ве статыстыкі і аналізу, Мін-ве працы, Нац. АН. Праблемы Д. даследуюць А.А.*Ракаў*, С.А.*Польскі*, Л.П.*Шахоцька*, Л.І.Спіжанкоў, Б.А.Манак, М.Р.Юркевіч, А.Н.Пешкава, Г.Ц.Максімаў, І.В.Насонава і інш.

ДЭМАДЭКО́З, залозніца, інвазійная хвароба чалавека і жывёлы з генералізаваным ці мясц. пашкоджаннем скуры. Выклікаецца кляшчом залозніца, які паразітуе ў валасяных фалікулах, сальных і потавых залозах. Лакалізацыя — найчасцей скура твару. Прыкметы: дробныя вузельчыкі і гнайнічкі на пачырванелым фоне, іншы раз лушчэнне. Цячэнне хваробы хранічнае, абвастрэнні ў вясна-летні перыяд. Д. мае цяжкую форму ў буйн. раг. жывёлы, свіней, сабак. *М.З.Ягоўдзік.*

ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЕ ТАВАРЫ́СТВА, тайная рэв. арг-цыя, якая дзейнічала ў 1836—38 у Віленскай мед. акадэміі. Заснавальнік і арганізатар Ф.А.*Савіч*. Складалася са студэнтаў і дробнай шляхты. Уваходзілі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей: беларусы, украінцы, палякі і інш. Мела статут «Прынцыпы дэмакратызму». У 1837 устанавіла сувязі з Ш.*Канарскім*, які ўзначальваў тайную арг-цыю «Садружнасць польскага народа», што дзейнічала на тэр. Беларусі, Літвы і Украіны. Д.т. пад назвай «Маладая Польшча» ўвайшло ў склад «Садружнасці» як яе радыкальнае крыло. Члены т-ва імкнуліся наладзіць сувязі з сялянамі, прапагандавалі сярод іх ідэі свабоды і роўнасці, выступалі за асвету народа, за права кожнага народа на нац. самастойнасць, адстойвалі ідэю рэв. саюзу братніх народаў у барацьбе супраць самадзяржаўя, лічылі сябе прадаўжальнікамі справы дзекабрыстаў. Найлепшай формай дзярж. кіравання абвяшчалі рэспубліку. Ідэалогія Д.т. адлюстроўвала працэс пераходу ад шляхецкай рэвалюцыйнасці да рэв. дэмакратызму. У чэрв. 1838 частка членаў Д.т. арыштавана. Савіч і яго памочнікі Я.Загорскі і К.Рабчынскі прыгавораны да ссылкі на Каўказ, астатнія аддадзены ў салдаты.

Літ.: Мохнач Н.Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30—40-е г. XIX в. Мн., 1971; Смирнов А.Ф. Революционные связи народов России и Польши, 30—60 гг. XIX в. М., 1962. *Н.Н.Махнач.*

ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ (англ. Democratic Party), адна з дзвюх асноўных паліт. партый у ЗША. Утворана ў 1828 прыхільнікамі кандыдата ў прэзідэнты ЗША Э.Джэксана як пераемніца *антыфедэралістаў* і Дэмакр.-рэсп. партыі Т.*Джэферсана*. Да сярэдзіны 19 ст. абапіралася пераважна на саюз дробных фермераў і заможных плантатараў-рабаўладальнікаў, выступала за дэмакратызацыю выбарчай сістэмы, абмежаванне ўлады Нац. банка ЗША, легалізацыю дзейнасці рабочых арг-цый, захаванне сістэмы рабства неграў, актыўную знешнюю палітыку. У грамадз. вайну 1861—65 падтрымлівала мяцежныя паўд. (рабаўладальніцкія) штаты. У 2-й пал. 19—20 ст. эвалюцыя праграмных установак партыі ішла ў кансерватыўна-ліберальным кірунку, пашырылася яе сац. база. Прэзідэнты ЗША ад Д.п. ўзначальвалі ўладу ў 1829—41 (Э.Джэксан і М.Ван Бурэн), 1845—49 (Дж.Н.Полк), 1853—61 (Ф.Пірс і Дж.Б'юкенен), 1885—89 і 1893—97 (С.Г.Кліўленд), 1913—21 (Т.В.*Вільсан*), 1933—53 (Ф.Д.*Рузвельт* і Г.*Трумэн*), 1961—69 (Дж.Ф.*Кенэдзі* і Л.Б.*Джонсан*), 1977—81 (Дж.Э.*Картэр*) і з 1993 (У.Дж.*Клінтан*). Партыя не мае пастаяннага членства, яе лідэр — дзеючы або былы прэзідэнт ЗША ці кандыдат у прэзідэнты. Раз у 4 гады склікаецца парт. з'езд, які прымае праграму, выбірае кандыдатаў на пасады прэзідэнта і віцэ-прэзідэнта ЗША; паміж з'ездамі парт. дзейнасць каардынуе Нац. к-т (штаб-кватэра ў Вашынгтоне). Сімвал Д.п. — выява асла.

Літ.: Романова Н.Х. Реформы Э.Джексона, 1829—1837. М., 1988; Галкин И.В. На пути в Белый дом: из истории дем. партии США (1920-е—1933 гг.). М., 1991; Манькин А.С. «Эра демократов»: партийная перегруппировка в США, 1933—1952. М., 1990.

ДЭМАКРА́ТЫЯ (ад грэч. dēmos народ + kratos улада), форма дзярж.-паліт. арганізацыі грамадства, заснаваная на прызнанні народа ў якасці крыніцы ўлады. Вядомы розныя гіст. формы Д.: першабытная, абшчынная, ваенная племянная, полісная арганізацыя грамадства ў гарадах-дзяржавах Стараж. Грэцыі і Італіі і рэсп. форма праўлення ў Стараж. Рыме; сярэдневяковыя гарады-рэспублікі (Венецыя, Генуя, Жэнева, Ноўгарад, Полацк і інш.). Дэмакр. ін-ты ўлады існавалі ў Англіі (парламент), Іспаніі (картэсы), Францыі (ген. штаты), ВКЛ (сейм і мясц. сеймікі) і інш. Важнымі гіст. вехамі на шляху ажыццяўлення ідэалаў Д. сталі нац.-вызв. барацьба і ўтварэнне суверэнных, незалежных дзяржаў у 19—20 ст., устанаўленне ліберальна-дэмакр. рэжымаў у шэрагу краін Усх. і Цэнтр. Еўропы ў 1990-я г. Прынцыпы Д. былі адлюстраваны ў Статуце ВКЛ 1588, Дэкларацыі незалежнасці ЗША (1776), «Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна», абвешчанай у 1789 у час. Франц. рэвалюцыі, Канстытуцыі ЗША (1791), Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека (1948) і інш. Вопыт Афін і шэрагу інш. грэч. полісаў паслужыў асновай для ўзнікнення тэорыі Д. ў працах Арыстоцеля, Платона і інш. стараж. філосафаў. Праблемы дэмакр. ўладкавання жыцця на прынцыпах «натуральнага права», роўнасці і свабоды, суверэннасці народа распрацоўвалі Дж.Лок, Ж.Ж.Русо, Ш.Л.Мантэск'ё, Т.Джэферсан, М.А.Бярдзяеў, бел. мысліцелі Ф.Скарына, А.Волан і інш. Прадстаўнікі гіст. матэрыялізму (К.Маркс, Ф.Энгельс, Г.Пляханаў, У.Ленін і інш.) разглядалі Д. ў сувязі з матэрыяльнымі ўмовамі жыцця грамадства, неабходнасцю стварэння ўмоў для рэальнага раўнапраўя людзей, усебаковага развіцця асобы. Паводле сучасных тэарэтыкаў Д. (Г.Арэнт, У.Ростаў, К.Попер, І.Шумпетэр, А.Тойнбі і інш.), развітую Д. можна напоўніць рэальным зместам

толькі пры ўмове свядомага ўдзелу ў паліт працэсе розных сац. сіл і грамадзян, але рэалізацыі гэтых умоў перашкаджае канцэнтрацыя эканам. улады ў руках «кіруючай эліты», якая стварае алігархічную мадэль улады і палітыкі.

Асн. прынцыпы палітычнай Д.: вяршэнства закона; роўнасць усіх грамадзян, сац. груп, нацый і народнасцей; гарантаванае захаванне правоў, свабод чалавека і грамадзяніна; выбарнасць кіраўніка дзяржавы і прадстаўнічых органаў; раздзяленне ўлад; паліт. плюралізм; *галоснасць*; шматпартыйнасць і інш. Эканамічная Д. знаходзіць сваё ўвасабленне ва ўтварэнні розных форм уласнасці, свабоднай прадпрымальніцкай і інш. эканам. дзейнасці, удзеле працоўных у кіраванні прадпрыемствамі, арг-цыямі і ўстановамі з мэтай павышэння эфектыўнасці іх работы і паляпшэння сац.-эканам. ўзроўню жыцця. Сацыяльная Д. — гэта сістэма ін-таў, якія гарантуюць рэалізацыю сац. каштоўнасцей (сістэма пенсіённага забеспячэння, страхавання па беспрацоўі, аховы здароўя, дапамогі сем'ям і інш.). Адрозніваюць непасрэдную Д. (асн. рашэнні прымаюцца непасрэдна грамадзянамі на *рэферэндумах*, сходах і да т.п.) і прадстаўнічую (рашэнні прымаюцца выбарнымі органамі). Тэрмін «Д.» ўжываецца і ў адносінах да грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў (напр., прафс., парт. Д.). Агульнай сац.-эканам. і паліт. асновай функцыянавання і развіцця Д. з'яўляецца пабудова *грамадзянскай супольнасці* і *прававой дзяржавы*. Як форма дзярж. ўладкавання і паліт. рэжыму Д. процістаўляецца антыдэмакратыі, аўтарытарызму, таталітарызму, дыктатуры, дэспатызму, фашызму і г.д.

У нац. заканадаўстве Рэспублікі Беларусь замацаваны асн. прынцыпы Д., якія ствараюць прававую аснову для арг-цыі і функцыянавання дэмакр. ін-таў і механізмаў улады: народаўладдзе, разнастайнасць паліт. ін-таў, ідэалогіі і поглядаў, раздзяленне ўлад, роўнасць усіх перад законам і права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў, адказнасць дзяржавы перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы і грамадзяніна перад дзяржавай за няўхільнае выкананне сваіх абавязкаў. *С.Ф.Дубянецкі.*

ДЭМАКРЫ́Т (Dēmokritos) з Абдэры (каля 460 г. да н.э. — ?; па некат. звестках пражыў больш за сто гадоў), старажытнагрэчаскі філосаф, адзін з заснавальнікаў ант. *атамістыкі*. Напісаў каля 70 твораў па філасофіі, фізіцы, матэматыцы, медыцыне, тэорыі музыкі і інш. Да нас дайшло каля 300 фрагментаў, пераважна з этычных твораў. Адным з гал. вытокаў філас. вучэння Д. служаць погляды *Леўкіпа*. У сваёй тэорыі пазнання Д. абгрунтоўваў думку пра існаванне 2 груп ведаў: заснаваных на пачуццях і на працы розуму; калі пачуцці ў стане прынесці няпоўныя, недакладныя і непраяснёныя («цёмныя») звесткі аб навакольнай рэчаіснасці, то чалавечае мысленне забяспечвае веды аб сапраўднай, г.зн. атамнай прыродзе рэчаў, таму што ўспрыманне і разуменне сутнасці атамаў даступны выключна розуму. Паводле некат. звестак, Д. пашырыў атамістычную тэорыю на тлумачэнне такіх філас. катэгорый, як час і прастора. Прытрымліваўся высновы аб неабходнай і заканамернай сувязі паміж усімі прадметамі і з'явамі прыроды і грамадства, лічыў, што гал. мэта пазнання — знаходжанне прычын прыродных і гіст. працэсаў. Значнае месца ў яго творчасці займаюць распрацоўка і паглыбленне тэорыі Леўкіпа аб касм. віхрах, дзе побач з поглядамі пра атамную будову касм. цел выказаны цікавыя здагадкі аб дыферэнцыяцыі касм. светаў, у



Дэмакрыт.

прыватнасці адносна існавання жыцця. Д. правёў параўнанне паміж чалавечым арганізмам (мікракосмасам) і космасам. Свае сац.-паліт. погляды ён канцэнтраваў на праблемах дэмакратыі; ідэальнай формай дзяржаўнасці лічыў стараж.-грэч. дзяржаву — поліс. У этыцы развіў вучэнне аб *атараксіі*.

Літ.: Лосев А.Ф. История античной философии в конспективном изложении. М., 1989; Яго ж. Античная философия истории. М., 1977. *В.І.Боўш.*

ДЭ́МАН (ад грэч. daimōn бажаство, дух), 1) у старажытнагрэчаскай рэлігіі і міфалогіі бажаство, дух, істота, якая садзейнічае ці перашкаджае чалавеку ў здзяйсненні яго намераў. 2) У хрысц. рэлігіі — д'ябал, злы дух, нячыстая сіла.

ДЭМАНАЛО́ГІЯ (ад *дэман* + *...логія*), рэлігійнае вучэнне пра злых духаў, заснаванае на першабытнай веры ў духаў (нячысцікаў), а таксама пра спосабы пазбаўлення ад іх людзей, апанаваных д'яблам. Такімі спосабамі хрысціяне лічаць малітвы, заклінанні і пэўныя культавыя дзеянні па выгнанні д'ябла (экзарцызм). Гіст. Д. бярэ пачатак у першабытнай веры ў духаў. Найб. значэнне мае ў рэлігіях з дуалістычным падзелам Сусвету на свет дабра і зла (*зараастрызм* і *маніхейства*). У больш позніх рэлігіях, на якія паўплываў зараастрызм (іудаізм, хрысціянства, іслам і інш.), Д. з'яўляецца таксама важнай састаўной ч. веравучэння. Большасць вобразаў бел. нар. Д. дахрысціянскага паходжання. У Д., як і ў *міфалогіі*, з'явы навакольнага свету, адухоўленыя нар. фантазіяй, адлюстраваны ў выглядзе фантаст. істот. Дэманалагічныя ўяўленні звязваліся з прыроднымі з'явамі (духі прыроды), гаспадаркай і хатнім побытам (хатнія духі), нягодамі, хваробамі, прычым пераважалі вобразы злой сілы. Нар. фантазія надзяляла іх чалавечымі рысамі, знешне падобнымі да чалавека (пераважна на старога дзядка з сівой барадой). Сярод духаў прыроды вылучаліся *лясун* — гаспадар лесу, *вадзянік* — дух вады, *палявік*, *жыцень* — духі палёў; вылучалі лазавіка, багніка, што нібыта жылі ў лазняку, багне. Большасць павер'яў пра хатніх духаў звязана з уяўленнямі пра «апекуна» дома і гаспадаркі *дамавіка*; бытавалі таксама ўяўленні пра хлеўніка, гуменніка, лазніка, ёўніка (апошняму часта ахвяроўвалі сноп жыта, каб не спаліў ёўню). Хваробы, паводле павер'яў, чынілі цётухны (увасаблялі ліхаманку), крыксы, начніцы (увасаблялі дзіцячыя хваробы), маровая панна (увасабляла мор, эпідэмію). Увасабленнем трывожнага сну была *мара*. Найб. пашыраным у нар. Д. быў вобраз *чорта*, які лічыўся прычынай усякай бяды, няшчасця, зла; быў падобны на *д'ябла* і служыў яго сінонімам. У канцы 19 — пач. 20 ст. вобразы нар. Д. страцілі рэліг. значэнне і засталіся ў фальклоры як персанажы нар. маст. фантазіі (трапляюцца пераважна ў былічках і чарадзейных казках).

М.Ф.Піліпенка.

ДЭМАНСТРА́ЦЫЯ (ад лац. demonstratio паказванне), 1) шэсце, мітынг і інш. формы выказвання грамадскіх настрояў. 2) Наглядны спосаб азнаямлення з якой-н. з'явай, прадметам. 3) Дзеянне, якое падкрэслена выказвае пэўныя пачуцці або пратэст, непрыязнасць, варожасць і інш.

ДЭМАНСТРА́ЦЫЯ ў біялогіі, 1) стэрэатыпныя акты паводзін жывёл, якія адыгрываюць ролю розных сігналаў у іх узаемаадносінах. Набор характэрных рухаў цела, поз і гукаў, што выкарыстоўваюцца асобінамі дадзенага віду ў якасці сігналаў пагрозы, прымірэння, прывітання, запрашэння да спароўвання і інш., зрэдку вылучаецца ў асобную катэгорыю дэманстрацыйных паводзін. Д. вывучае *эталогія*. 2) Яркая афарбоўка жывёл, якая робіць іх прыкметнымі на фоне навакольнага асяроддзя; адзін з тыпаў ахоўнай афарбоўкі і формы (*мімікрыя*). Садзейнічае поспеху ў барацьбе за існаванне — выжыванню і ўзнаўленню. Д. мае вял. біял. значэнне ва ўзаемаадносінах жывёл у біяцэнозах.

ДЭМАРКАЦЫ́ЙНАЯ ЛІ́НІЯ, 1) лінія (паласа), якая размяжоўвае ваюючыя бакі на час перамір'я (лінія спынення агню). 2) Лінія, якая падзяляе на зоны тэрыторыю пераможанай дзяржавы. 3) Лінія (паласа), якая ўстанаўліваецца часова на тэрыторыі, што аспрэчваецца суседнімі дзяржавамі, да вырашэння пытання аб пастаяннай граніцы.

ДЭМАРКА́ЦЫЯ ГРАНІ́Ц, вызначэнне лініі дзярж. граніцы на мясцовасці шляхам устанаўлення пагранічных знакаў на падставе дакументаў аб *дэлімітацыі граніц*. Ажыццяўляецца змешанымі камісіямі, якія ствараюцца дагаворнымі бакамі на парытэтных пачатках.

ДЭМА́РШ (франц. démarche літар. выступленне), пратэст, просьба або рэсцярога па якім-н. пытанні, заява ўрада ці ведамства замежных спраў адной дзяржавы іншай дзяржаве. Можа быць выказаны ў *ноце*, *мемарандуме* і інш.

ДЭ́МАС (ад грэч. dēmos народ), у Стараж. Грэцыі назва насельніцтва вобласці (ці самой вобласці), а таксама супольнасць паўнапраўных грамадзян у адрозненне ад рабоў, *метэкаў*, *перыэкаў* і інш. У гамераўскую (11—9 ст. да н.э.) і архаічную (8—6 ст. да н.э.) эпохі Д. называлі нар. масы ў адрозненне ад радавой арыстакратыі — *эўпатрыдаў*, у 6—5 ст. да н.э. разам з сял. насельніцтвам — частку гар. (рамеснікі, гандляры), з канца 5—4 ст. — бедную (пераважна гар.) частку насельніцтва.

ДЭМАСФЕ́Н (Dēmosthenēs; каля 384, п-аў Атыка, Грэцыя — 12.10.322 да н.э.), старажытнагрэчаскі паліт. дзеяч і прафес. прамоўца. Выступаў супраць захопніцкай палітыкі Македоніі і яе цара Філіпа II («філіпікі»), пасля чаго стаў прызнаным лідэрам Афін (341). Дамогся стварэння антымакед. кааліцыі стараж.-грэч. полісаў. У 330 да н.э. ўзнаг. афінянамі ганаровым залатым вянком. Пасля смерці Аляксандра Македонскага (323) зноў заклікаў да барацьбы супраць Македоніі. У выніку паражэння антымакед. кааліцыі ў Ламійскай вайне (323—322 да н.э.), ратуючыся ад праследавання, скончыў самагубствам. Захаваліся тэксты каля 60 прамоў, якія прыпісваюцца Д.

Тв.: Рус. пер. — Речи. Т. 1—3. М., 1994—96.

Дэмасфен. Мармуровая копія старажытнагрэчаскай бронзавай статуі.

ДЭМАТЫ́ЧНАЕ ПІСЬМО́, позні від іерагліфічнага *егіпецкага пісьма* для хуткага запісу на папірусе вял. тэкстаў. Д.п. прыйшло на змену іератычнаму пісьму каля 6—7 ст. да н.э. і заставалася пісьмом егіпцян да 3 ст. н.э., калі змянілася *копцкім пісьмом* і значэнне іерогліфаў было забыта. У 1799 каля г. Разета (дэльта Ніла) знойдзены т.зв. Разецкі камень, на якім былі высечаны 2 іерагліфічныя надпісы і 1 на стараж. грэч. мове; адзін з іерагліфічных надпісаў выкананы манументальнымі іерогліфамі, другі — Д.п. У 1822 франц. вучоны Ж.Ф.Шампальён расшыфраваў іх і прыйшоў да высновы, што Д.п. максімальна набліжана да фанетычнага пісьма і складаецца з 3 відаў знакаў: ідэаграфічных, фанетычных і дэтэрмінатываў.

Літ.: Павленко Н.А. История письма. 2 изд. Мн., 1987.

А.М.Рудэнка.



Дэматычнае пісьмо.

ДЭМБІ́НСКІ (Dembiński) Генрык (16.1.1791, в. Стшалкаў Келецкага ваяв., Польшча — 13.6.1864), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1830—31* у Польшчы, Беларусі і Літве. Вучыўся ў ваенна-інжынернай акадэміі ў Вене, служыў у войску герцагства Варшаўскага. Удзельнічаў у кампаніях войск Напалеона. У час паўстання 1830—31 капітан, пасля палкоўнік, генерал брыгады. Пад Райградам разбіў рус. атрад ген. Ф.В.Остэн-Сакена (29.5.1831). Летам 1831 уступіў на тэр. Беларусі, але неўзабаве адышоў у Польшчу. Нам. галоўнакамандуючага, потым губернатар Варшавы і галоўнакамандуючы польскім войскам. Здаў Варшаву рус. войскам. Пасля паражэння паўстання жыў за мяжой, служыў у егіпецкай арміі. Удзельнік венгерскай рэвалюцыі 1848—49, галоўнакамандуючы рэв. арміяй. Пасля паражэння рэвалюцыі жыў у Турцыі, Францыі. Аўтар успамінаў.

В.В.Шведа.

ДЭМБІ́НСКІ Генрык (30.7.1908, г. Іркуцк, Расія — 12.8.1941), удзельнік рэв. руху ў Зах. Беларусі, публіцыст. Пасля 1-й сусв. вайны жыў у Ашмянах. З канца 1932 у Віленскім ун-це на чале антыфаш. групы Студэнцкай лявіцы «*Фронт*». У 1935 адзін з заснавальнікаў легальнай антыфаш. студэнцкай газ. «Poprostu» («Папросту»). Удзельнік *антыфашысцкага кангрэса дзеячаў культуры 1936* у Львове. У 1937 засуджаны на 4 гады турмы. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР інспектар раённага аддзела нар. асветы. Расстраляны гітлераўцамі ў Ганцавічах.

Тв.: Wybór pism. Warszawa, 1962.

Літ.: Brodowski L. Henryk Dembiński: człowiek dialogu. Warszawa; Kraków, 1988.

ДЭМБІ́НСКІ Мікалай Уладзіслававіч (30.8.1899, г. Чарнігаў, Украіна — 22.4.1988), бел. вучоны ў галіне эканомікі. Д-р эканам. н. (1971), праф. (1961). Засл. дз. нав. БССР (1972). Скончыў Усесаюзны завочны фін.-эканам. ін-т (1932). З 1932 у Куйбышаўскім планавым ін-це. У 1947—87 у Бел. ін-це нар. гаспадаркі, з 1964 заг. кафедры эканам. аналізу і механізацыі ўліку. Даследаваў праблемы павышэння эфектыўнасці вытв-сці ў прамысловасці, тэорыі эканам. аналізу і бухгалтарскага ўліку.

Тв.: Вопросы теории экономического анализа. М., 1973; Основные направления повышения эффективности производства в промышленности. Мн., 1976 (разам з В.Г.Храпчанкавым); Анализ экономики промышленного предприятия. Мн., 1979.

ДЭМБО́ЎСКАЯ (Dembowska) Зоф'я (па мужу Ромер; 16.2.1885, г. Тарту, Эстонія — 23.8.1972), беларуска-польская мастачка. Брала ўрокі малявання ў Вільні і Кракаве. У 1914—41 жыла ў Віцебскай вобл. Працавала ў жывапісе і графіцы. Да 1920 стварыла цыкл партрэтаў дзеячаў віленскіх універсітэцкіх і літ. колаў: рэктара М.Ромера, д-ра К.Міхейды, праф. Р.Радзіловіча, М.Здзяхоўскага і інш. У 1920-я г. пісала пейзажы («Дарога», «Вербы», «Стары дом», «Мост», «Снег» і інш.). З 1943 працавала ў Егіпце, Англіі, Канадзе, ЗША, дзе малявала партрэты арыстакратаў, чл. каралеўскіх сем'яў, вядомых палітыкаў і дзеячаў навукі і культуры.

І.А.Масляніцына.

ДЭМБО́ЎСКІ (Dembowski) Эдвард (25.4 або 31.5.1822, Варшава —

27.2.1846), польскі паліт. дзеяч, філосаф, публіцыст. У 1842—43 рэдактар і выдавец час. «Przegląd Naukowy» («Навуковы агляд»), вакол якога аб'ядналася незалежная маладая інтэлігенцыя. Пад уплывам Г.Каменскага ўступіў у Саюз польск. народа і разам з П.Сцягенным прымаў удзел у падрыхтоўцы нар. паўстання. У 1843 пад пагрозай арышту ўцёк у Познань, дзейнічаў у незалежніцкім руху ў Малапольшчы. З 1845 у Галіцыі, адзін з кіраўнікоў *Кракаўскага паўстання 1846*. Застрэлены аўстрыйцамі ў час дэманстрацыі. Аўтар прац «Думкі пра будучыню філасофіі», «Нарыс гісторыі польскай літаратуры» (абедзве 1845) і інш.

Тв.: Pisma. T. 1—5. Warszawa, 1955.

Літ.: Szypowska M. Edward Dembowski, 1822—1846. Warszawa, 1973. *Н.К.Мазоўка.*

ДЭМБО́ЎСКІ (Dembowski) Ян (26.12.1889, С.-Пецярбург — 22.9.1963), польскі заолаг, грамадскі і дзярж. дзеяч. Акад. Польскай АН (1951). Замежны чл. АН СССР (з 1958). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1912). З 1922 працаваў у Ін-це імя М.Ненцкага ў Варшаве (з 1933 дырэктар), у 1934—39 у Віленскім ун-це. У 1944—47 аташэ пасольства ПНР у Маскве і адначасова супрацоўнік Ін-та эксперым. біялогіі АМН СССР. З 1947 праф. Лодзінскага ун-та, у 1951—56 прэзідэнт Польскай АН, у 1952—60 дырэктар Ін-та эксперым. біялогіі. Навук. працы па эталогіі і зоапсіхалогіі розных груп жывёл. Вывучаў рытм дзялення і трапізм у інфузорый.

ДЭ́МБРАВА, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Спушанка. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 23 км на З ад Шчучына, 46 км ад Гродна, 19 км ад чыг. ст. Скідзель. 612 ж., 204 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква, касцёл.

ДЭМЕРА́РА (Demerara), буйны баксітаносны раён у паўн. ч. Гаяны, паблізу Атл. ўзбярэжжа. Уключае больш за 100 радовішчаў, якія ўтвараюць баксітаносную зону, выцягнутую ўздоўж узбярэжжа на 150 км пры шыр. каля 25 км. Асваенне з 1917. Геал. запасы 800 млн. т. Баксіты латэрытна-асадкавыя, пераважна гібсітавыя, з колькасцю гліназёму Al_2O_3 60—63%. Распрацоўка адкрытым спосабам. Цэнтр здабычы — Макензі.

ДЭМЕ́ТРА, у грэчаскай міфалогіі багіня ўрадлівасці і земляробства, дачка *Кронаса* і *Рэі*, сястра *Зеўса*. Дачку Д. *Персефону* пакахаў і ўкраў бог падземнага царства *Аід*. Пакуль Д. блукала ў пошуках дачкі, зямля перастала плоданасіць, засохлі дрэвы і травы, загінулі статкі, пачаўся голад. Зеўс загадаў вярнуць Персефону, каб летнія месяцы яна праводзіла на зямлі, зімовыя — у царстве Аіда. У г. Элеўсін быў узведзены храм Д., дзе 9 дзён у верасні спраўлялі *містэрыі*, у гонар Д. і Персефоны ладзілі святы Фесмафорыі. Свае творы Д. прысвяцілі Гамер, Калімах, Феакрыт, Г.Сакс, Ф.Шылер і інш. У рым. міфалогіі Д. адпавядае *Цэрэра*. *Л.М.Драбовіч.*

ДЭМЕ́ТРЫЙ І ПАЛІЯРКЕ́Т (грэч. Dēmētrios Poliorkētēs, каля 337, Македонія — 283 да н.э.), палкаводзец эліністычнага перыяду. Сын Антыгона I Аднавокага, паплечніка *Аляксандра Македонскага*. Разам з бацькам прымаў удзел у барацьбе *дыядохаў*. У 306 перамог флот Пталамея каля Саламіна на Кіпры, разам з бацькам прыняў тытул цара. У 301 каля г. Іпс Антыгон і Д.П. пацярпелі паражэнне, Антыгон быў забіты, Д.П. уцёк. У 295 захапіў Афіны, у 294—288 валодаў Македоніяй. У 287 у М. Азіі пацярпеў паражэнне ад караля Сірыі Селеўка I, трапіў у палон, дзе і памёр. Біяграфію Д.П. дае Плутарх у «Параўнальных жыццяпісах».

ДЭМІ́ (Demy) Жак (н. 5.6.1931, г. Паншато, Францыя), французскі кінарэжысёр. Вучыўся ў Акадэміі прыгожых мастацтваў і ў Ін-це вышэйшай кінематаграфічнай адукацыі ў Парыжы. Вядомасць прынёс яму музычны фільм «Шэрбурскія парасоны» (1964) — вытанчанае, прасякнутае лірызмам апавяданне пра каханне і разлуку. Сярод інш. фільмаў: «Дзяўчаты з Рашфора» (1967), «Атэлье мадэляў» (1969, ЗША), «Асліная шкура» (1970), «Пацукалоў» (1972, Вялікабрытанія), «Лэдзі О» (1979, Японія), «Пакой у горадзе» (1982). У фільмах Д. раскрыўся талент К.*Дэнёў*.

ДЭМІЛІТАРЫЗА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *мілітарызацыя*), у міжнародным праве ліквідацыя на падставе дагавора ваен. умацаванняў і збудаванняў на пэўнай тэрыторыі, а таксама забарона ўтрымліваць на ёй ваен. базы і ўзбр. сілы або іх абмежаванне. Адрозніваюць поўную (Антарктыка, Аландскі архіпелаг, Шпіцберген, нябесныя целы, у т.л. Месяц) і частковую Д. (напр., стварэнне бяз'ядзерных зон). Д. таксама ўстанаўліваецца з мэтай гарантавання бяспекі дзяржавы-пераможцы з боку пераможанай дзяржавы: напр. Д. Германіі пасля 1-й сусв. вайны паводле Версальскага мірнага дагавора 1919 і пасля 2-й сусв. вайны паводле рашэнняў Патсдамскай канферэнцыі 1945, Д. Японіі паводле Сан-Францыскага мірнага дагавора 1951.

Дэметра («Дэметра Кнідская»). Скульптар Брыяксіс. 340—330 да н.э.

ДЭМІНЕРАЛІЗАВА́НАЯ ВАДА́, гл. ў арт. *Дыстыляваная вада*.

ДЭМІРЧА́Н Дэрэнік Карапетавіч (18.2.1877, г. Ахалкалакі, Арменія — 6.12.1956), армянскі пісьменнік. Засл. дз. мастацтваў Арменіі (1940). Акад. АН Арменіі (1953). Вучыўся ў Эчміядзінскай духоўнай акадэміі (1892—94). Скончыў тбіліскую семінарыю Нэрсісян (1897), Жэнеўскі ун-т (1909). Друкаваўся з 1893. Аўтар паэт. кніг «Вершы» (1899 і 1913), «Вясна» (1920). Найб. ярка яго талент выявіўся ў драматургіі і прозе. Пра гіст. мінулае арм. народа раманы «Вардананк» (т. 1—2, 1943—46), «Месроп Маштоц» (незавершаны, кн. 1, 1956). Аўтар п'ес «Фасфарычны прамень» (1932), «Напалеон Каркацян» (1934), прац па літаратура-, мова- і мастацтвазнаўстве, гістарыяграфіі. На бел. мову творы Д. пераклалі В.Лукша, М.Татур. *Д.Гаспарян.*

ДЭМІРЭ́ЛЬ (Demirel) Сулейман (н. 1.11.1924, Ісламкёй, пав. Іспарта, Турцыя), дзяржаўны і паліт. дзеяч Турцыі. Скончыў Стамбульскі тэхн. ун-т (1949). У 1964—80 ген. старшыня Партыі справядлівасці. У 1965—71, 1975—77 (з перапынкамі), 1979—80 і ў 1991—93 прэм'ер-міністр Турцыі. Пасля ваен. перавароту 1980 двойчы інтэрніраваны (1980, 1983), апынуўся ў групе паліткаў, якім была забаронена любая паліт. дзейнасць. Пасля вяртання ў 1983 да парламенцкага праўлення адзін са стваральнікаў, з 1987 ген. старшыня Партыі правільнага шляху (праваераемніцы Партыі справядлівасці). З 1993 прэзідэнт Турцыі.

ДЭМІ́УРГ (ад грэч. dēmiurgos майстар, стваральнік), у Стараж. Грэцыі ў гамераўскі перыяд — рамеснікі, майстры, урачы, паэты і інш., у класічны — толькі рамеснікі, у некат. гарадах-палісах — вышэйшыя службовыя асобы. У рэлігіі адно з вызначэнняў Бога. Упершыню тэрмін Д. выкарыстаны Філалаем з Кратона і сафістам Крытыем (5 ст. да н.э.). У ант. філасофіі (Платон) — паняцце, якое выяўляе творчую функцыю ідэальных сутнасцей (істот) у працэсе пераходу іх да матэрыяльнага космасу. У дыялогу Платона «Тымей»

паняцце Д., што раскрывае дыялектыку космасу, з'яўляецца адным з ключавых. Д. прадстаўлены як тварэц і бацька космасу, ніжэйшых багоў, сусв. душы і да т.п. Зыходным матэрыялам для ствараль-най дзейнасці Д. служыць матэрыя («пластычная маса»), вобразам — першавобраз-парадыгма Эйдас. У сярэдневякоўі паняцце Д. часцей за ўсё трактавалася як ідэальная першааснова, якая стварае свет. У філасофіі Г.Гегеля ў якасці Д. выступае анталагізаванае мысленне суб'екта — абсалютны дух; менавіта ён з'яўляецца стваральнікам свету. У сучаснай філас. л-ры, калі ідзе гаворка аб паняцці Д., часцей за ўсё маецца на ўвазе гегелеўская трактоўка гэтага паняцця. *Т.І.Адула.*

ДЭ-МОЙН (Des Moines), горад у цэнтр.ч. ЗША, на р. Дэ-Мойн. Адм. ц. штата Аява. Засн. ў 1843. 193,2 тыс. ж., з прыгарадамі каля 400 тыс. ж. (1990). Вузел чыгунак і аўтадарог. Гандл.-фін. цэнтр кукурузна-жывёлагадоўчага пояса ЗША. Прам-сць: маш.-буд. (вытв-сць бавоўна- і кукурузаўборачных камбайнаў, трактароў, культыватараў і інш.), харч. (мукамольная, мясакансервавая), паліграф., металаапр., шынная. Ун-т. Цэнтр мастацтва.

ДЭ́МПА (Dempo), дзеючы вулкан на ПдЗ в-ва Суматра (хр. Барысан) у Інданезіі. Выш. 3159 м. Складзены з андэзітаў. Магутнае вывяржэнне ў 1908.

ДЭ́МПІНГ (англ. dumping літар. скідванне), продаж тавараў на знешнім рынку па штучна заніжаных цэнах, магчыма, ніжэй сабекошту. Мэта Д.: спрыянне экспансіі на новыя рынкі і абарона пазіцый дадзенай дзяржавы на замежных рынках шляхам абмежавання канкурэнцыі; процідзеянне залішняму продажу тавараў на ўнутр. рынку, які прыводзіць да зніжэння цэн, і, як вынік, да змяншэння даходаў вытворцаў. Д. выклікае негатыўныя вынікі: у краіне экспарцёра для спажыўцоў, што плацяць высокія цэны і пакрываюць страты ад нізкіх дэмпінгавых цэн; у краіне імпарцёра стрымлівае айчынную вытв-сць (спрыяе росту беспрацоўя), прадукцыя якой становіцца неканкурэнтаздольнай побач з больш таннай імпартаванай. ЕЭС забараніла Д. паводле Рымскага трактата 1957. Антыдэмпінгавы кодэкс, што прадугледжвае правядзенне перагавораў пад эгідай ГАТТ, прыняты ў час т.зв. такійскага раунда 1973—79. Д. валютны — вынік *дэвальвацыі.*

ДЭ́МПФЕР (ад ням. Dämpfer глушыцель), прыстасаванне для гашэння (паглынання, заспакаення) шкодных ваганняў у машынах, механізмах, прыладах, канструкцыях.

Падзяляюцца на фрыкцыйныя (заспакойваюць ваганні пераўтварэннем энергіі ваганняў у работу трэння, якое ствараецца паміж элементамі Д.) і дынамічныя (змяняюць частату ўласных ваганняў сістэмы адносна частаты вонкавых сіл, каб папярэдзіць рэзананс); паводле канструкцыі — на мех., гідраўл. (напр., поршні ў вязкіх асяроддзях), пнеўматычныя, эл.-магн. і інш. Выкарыстоўваюцца ў рухавіках унутр. згарання, аўтам. рэгулятарах і вымяральных прыладах (гідраўл. і пнеўматычныя), у эл. машынах (у выглядзе шпуль індуктыўнасці, рэзістараў), у многаструнных муз. інструментах (калодачкі або планкі, абклееныя лямцам, для спынення ваганняў струн) і інш.

ДЭМУЛЕ́Н (Desmoulins) Каміль (2.3.1760, Гіз, каля г. Сен-Кантэн, Францыя — 5.4.1794), дзеяч франц. рэвалюцыі канца 18 ст., адвакат і журналіст. Напярэдадні паўстання 14.7.1789 заклікаў народ да ўзбр. барацьбы супраць манархіі. Рэдагаваў шэраг дэмакр. газет. У Канвенце выступаў супраць жырандыстаў, прыхільнік Ж.Ж.*Дантона.* У канцы 1793 — пач. 1794 выдаваў час. «Le Vieux Cordelier» («Стары кардэльер»), у якім патрабаваў адмены закону аб максімуме, змякчэння рэв. тэрору, крытыкаваў палітыку М.*Рабесп'ера.* Паводле рашэння рэв. трыбунала гільяцінаваны.

ДЭ́МУТ-МАЛІНО́ЎСКІ Васіль Іванавіч (13.3.1779, С.-Пецярбург — 28.7.1846), рускі скульптар-манументаліст. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1785—1800) у М.І.*Казлоўскага,* выкладаў там у 1808—36; праф. з 1813, рэктар па аддзеле скульптуры з 1836. Пенсіянер АМ у Рыме (1803—06). Выканаў разам з С.С.Пімена-вым аздабленне ў стылі ампір шэрагу арх. збудаванняў. Аўтар манум.-дэкар. скульптурнай групы «Выкраданне Празерпіны» перад гал. фасадам Горнага ін-та (1809—11), барэльефаў Міхайлаўскага палаца (цяпер Рускі музей, 1823—25), скульпт. групы на атыку Гал. штаба на Дварцовай пл. (1827—28, усе ў Пецярбургу) і інш. Творам уласцівы гераічны лад вобразаў, урачысты рытм і яснасць кампазіцыйных вырашэнняў, арган. адзінства з архітэктурай. Працаваў у станковай (у т.л. партрэтнай) і надмагільнай пластыцы (надмагіллі М.І.Казлоўскага, 1802—03; М.Б.Барклая дэ Толі, 1823, і інш.).

В.Дэмут-Маліноўскі. Надмагілле М.І.Казлоўскага. 1802—03.

ДЭМУЛО́ГІЯ, гл. *Экалогія папуляцыйная.*

ДЭНАМІНА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + лац. nominatio найменне), узбуйненне грашовай адзінкі краіны (без яе перайменавання) з мэтай упарадкавання грашовага абарачэння і надання большай паўнацэннасці нац. валюце. Часта прычынай Д. бываюць складанасці тэхн. забеспячэння (друкаванне грашовых знакаў, захаванне неабходных суадносін паміж рознымі купюрамі, выраб разменнай манеты буйных наміналаў і да т.п.) грашовага абарачэння ва ўмовах інфляцыі. У Рэспубліцы Беларусь апошняя Д. нац. валюты адбылася ў 1994.

ДЭНАНСА́ЦЫЯ (ад франц. dénoncer абвяшчаць, касаваць), адмова аднаго з бакоў міжнароднага дагавора ад яго выканання. Звычайна права Д., яе формы і тэрміны прадугледжваюцца ў самім *дагаворы.* Д. шматбаковых дагавораў мае сілу толькі для той дзяржавы, якая яго дэнансавала; паміж яго інш. ўдзельнікамі дагавор працягвае дзейнічаць. Д. міжнар. дагавораў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца Палатай прадстаўнікоў Нац. сходу Рэспублікі Беларусь.

ДЭНА́РЫЙ (ад лац. denarius які складаецца з дзесяці), 1) сярэбраная манета Стараж. Рыма, чаканілася ў 269 да н.э. — 1-й пал. 3 ст. 2) Сярэбраная манета герм. дзяржаў у 5 — сярэдзіне 8 ст., якая імітавала рымскі Д. 3) Сярэбраная манета дзяржаў Зах. Еўропы ў сярэдзіне 8 — 1-й пал. 12 ст. У Беларусі абарачалася ў канцы 10 ст. — сярэдзіне 1060-х г. 4) Сярэбраная, потым білонная і медная разменная манета ў дзяржавах Зах. Еўропы ў 13—17 ст. 5) Сярэбраная манета ВКЛ у 14—15 ст., білонная — у 16 ст. У 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. вядомы білонны двайны Д. 6) Сучасная назва разменнай манеты ў Іраку, Босніі і Герцагавіне, Македоніі, Югаславіі.

ДЭНАТУРАВА́НЫ СПІРТ, дэнатурат, этылавы спірт-сырэц з дабаўкамі фарбавальніку, які надае яму сіне-фія-

летавы колер, а таксама спец. рэчываў (пераважна пірыдзінавых асноў) з непрыемным пахам і смакам. Мае сівушнае масла, метанол і інш. шкодныя для арганізма прымесі, якія нельга вылучыць перагонкай, вымарожваннем і інш. найпрасцейшымі фізіка-хім. метадамі. Выкарыстоўваюць як растваральнік лакаў і палітур. Таксічны.

ДЭНАТУРА́ЦЫЯ (ад *дэ*... + лац. natura прыродныя ўласцівасці, сутнасць) у біяхіміі, страта біяпалімерамі прыроднай (натыўнай) канфігурацыі і біял. уласцівасцей у выніку разбурэння іх другаснай і трацічнай структуры пад уплывам фіз. і хім. фактараў. Пры Д. з малекул бялкоў, нуклеінавых к-т і інш. біяпалімераў утвараецца сумесь неўпарадкаваных ланцугоў поліпептыдаў, полінуклеідаў і інш. біяпалімераў, якія могуць выпадаць у асадак. Асн. фактары, што выклікаюць Д., — т-ра, змены pH (пры дабаўленні к-т і шчолачаў), арган. растваральнікі, іоны цяжкіх металаў, хаатропныя рэагенты тыпу дэтэргентаў. З'ява Д. выкарыстоўваецца пры выпечцы хлеба, у кандытарскай, кансервавай і інш. галінах прам-сці.

ДЭНАЦЫФІКА́ЦЫЯ, комплекс мерапрыемстваў дзяржаў-пераможцаў (СССР, ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі) па ліквідацыі наступстваў нацыянал-сацыялісцкага рэжыму ў Германіі і Аўстрыі пасля 2-й сусв. вайны. Паводле рашэнняў *Крымскай канферэнцыі 1945* і *Патсдамскай канферэнцыі 1945* прадугледжвалася знішчыць фаш. нацыянал-сацыялісцкую рабочую партыю Германіі, яе філіялы і падкантрольныя арг-цыі; распусціць усе нацысцкія ўстановы і не дапусціць іх адраджэння ў любой форме; прыцягнуць да адказнасці злачынцаў супраць міру і чалавечнасці і інш. На *Нюрнбергскім працэсе* асуджаны гал. ням. ваен. злачынцы, абвешчаны злачыннымі кіраўніцтва нацыянал-сацыялісцкай партыі, гестапа, СД і СС. Найб. актыўна і паслядоўна Д. праводзілася ў сав. акупац. зоне (Усх. Германія), дзе яна завяршылася ў сак. 1948 (напр., да жн. 1947 з розных органаў кіравання звольнена каля 500 тыс. актыўных нацыстаў). На З Германіі ва ўмовах «халоднай вайны» Д. з 1949 па даручэнні амер., брыт. і франц. акупац. адміністрацый працягвалі ўлады навастворанай ФРГ (да сярэдзіны 1950-х г. да адказнасці прыцягваліся 6,08 млн. чал., з іх большасць апраўдана). У Аўстрыі Д. завершана паміж 1948 (частковая амністыя) і 1957 (агульная амністыя б. нацыстаў).

ДЭНАЦЫЯНАЛІЗА́ЦЫЯ (ад *дэ*... + *нацыяналізацыя*), 1) у сац.-эканам. і паліт. сэнсе — пераўтварэнне дзяржаўнай (нац.) уласнасці, якая ўзнікла ў выніку *нацыяналізацыі*, у прыватную, каап., калект., акцыянерную або змешаную. Стала асн. зместам сац.-эканам. пераўтварэння ў час т. зв. першай хвалі лібералізму і свабоднага гандлю ў краінах Зах. Еўропы, ЗША, Японіі ў канцы 19 — пач. 20 ст. і новай хвалі лібералізму і рэфармавання эканомікі, якая пачалася ў пачатку 1980-х г. і ахапіла фактычна ўвесь свет. У 1950-я г. праводзілася звычайна шляхам продажу дзярж. уласнасці (прамысл. прадпрыемстваў, зямельных участкаў, акцый і інш.) або распродажу часткі акцый дзярж. кампаній, калі дзярж. ўласнасць ператваралася ў змешаную дзярж.-прыватную ўласнасць. Спецыфічнымі формамі Д. быў распродаж дзярж. прадпрыемстваў, пабудаваных за кошт дзяржавы, у час 2-й сусв. вайны, продаж акцый рабочым і службовым дзярж. прадпрыемстваў (ЗША, Германія, Італія, Бельгія і інш.). У Вялікабрытаніі, Францыі і інш. краінах звычайна ўжываецца ў адносінах да часткі нацыяналізаваных галін нар. гаспадаркі (прамысловасць, банкі, транспарт, сувязь і г.д.). З 2-й пал. 1980 — пач. 90-х г. Д. стала найб. важнай умовай фарміравання асноў эканам. свабоды грамадзян, пераадолення манапалізму і стварэння канкурэнтнага асяроддзя для эфектыўнага функцыянавання эканомікі ў краінах Лац. Амерыкі, Паўд.-Усх. Азіі, Цэнтр. і Усх. Еўропы і інш.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (1993) Д. ажыццяўляецца шляхам бязвыплатнай перадачы або продажу дзярж. або муніцыпальнай уласнасці калектывам, замежным фірмам, прыватным асобам (гл. таксама *Прыватызацыя*, *Раздзяржаўленне*). 2) У этнічным сэнсе — тое, што *дээтнізацыя*.

С.Ф.Дубянецкі.

ДЭ́НБІ (Denbigh), Крамянёвы комплекс Дэнбі, даэскімоская археал. культура Паўн. Амерыкі. Адкрыта ў 1948 у эскімоскім паселішчы Аятэет на мысе Дэнбі у зал. Нортан (Аляска). Блізкія да Д. культуры выяўлены на мысе ў зал. Кацэбу, на Арктычным узбярэжжы Аляскі, у Канадзе і ПнУ Грэнландыі. Для Д. характэрны дробныя ножападобныя пласцінкі, маленькія ababітыя бакавыя і канцавыя лёзы-ўкладышы, разцы, скрабкі і нажы, вастрыі стараж. амер. тыпаў. Датуецца часам больш за 2500 гадоў да н.э.

ДЭ́НВЕР (Denver), горад на З ЗША, каля ўсх. падножжа Скалістых гор, на р. Саўт-Плат. Адм. ц. штата Каларада. Засн. ў 1858 золаташукальнікамі. 467,6 тыс. ж., з горадам Боўлдэр і агульнымі прыгарадамі каля 2 млн. ж. (1990). Гал. прамысл., гандл.-фін. цэнтр і трансп. вузел Горных штатаў. Міжнар. аэрапорт. Цэнтр вял. с.-г. (жывёлагадоўля, цукр. буракі) і горнапрамысл. (каштоўныя і рэдкія металы, уран) раёна. Прам-сць: авіяракетная, радыёэлектронная (вытв-сць ЭВМ і інш.), маш.-буд. (прылада- і аўтабудаванне, вытв-сць дарожна-буд. машын, горнага і інш. прамысл. абсталявання), харчасмакавая (мясная, малочная, мукамольная, цукр., піваварная), металаапр., паліграф., цэм., хім., гумава-тэхн., гарбарна-абутковая. Вытв-сць спарт. інвентару. 2 ун-ты. Музеі. Турызм, цэнтр зімовага спорту. Каля Д. нац. парк Рокі-Маўнтын.

ДЭ́НГАФЫ, шляхецкі род герба «Дзік» у Рэчы Паспалітай. Найб. вядомыя:

Герард (каля 1632—5.1.1685), харужы надворны каронны (1661), чашнік ВКЛ (1661), падстолі ВКЛ (1666). Тэадор (?—1684), ваявода дорпцкі, падстолі ВКЛ (1655), крайчы ВКЛ (1656), падскарбі надворны (1658), падкаморы каронны (1661). Эрнест (? — жн. 1693), ген.-м. (1670), лоўчы ВКЛ (1676), кашталян віленскі (1683), ваявода мальборкскі (1685). Удзельнічаў у войнах з туркамі, шведамі, укр. казакамі, Рас. дзяржавай. Фрэдэрык Юзаф (? — 1723), палкоўнік гаспадарскі, падчашы ВКЛ (1712). Станіслаў Міхал Эрнест (каля 1673 — 2.8.1728), лоўчы ВКЛ (1697), мечнік каронны (1704), гетман польны ВКЛ (1709), ваявода полацкі (1723), староста мазырскі, у 1702—17 маршалак Сандамірскай канфедэрацыі. Удзельнічаў у бітвах са шведамі пад Варшавай (1705) і прыхільнікамі Ляшчынскага пад Калішам (1706). У канцы жыцця ў апазіцыі да Аўгуста II. Багуслаў Эрнест (? — 1734), падкаморы ВКЛ (1702), ген.-л. (1705), ген. артылерыі ВКЛ (1710—25).

ДЭНДРА... (ад лац. dendron дрэва), першая састаўная частка складаных слоў, якая па значэнні адпавядае слову «дрэва», напр., *дэндралогія*, *дэндрабіёнты*.

ДЭНДРАБІЁНТЫ [ад *дэндра*... + *біёнт*(ы)], арганізмы, якія насяляюць дрэвавы ярус расліннасці. У фауне сярод пазваночных Д. пераважаюць птушкі, шмат Д. сярод насякомых, павукападобных і інш. груп беспазваночных.

ДЭНДРАКЛІМАТАЛО́ГІЯ (ад *дэндра*... + *кліматалогія*), навука пра метады вывучэння клімату мінулых эпох па зменах велічынь гадавых кольцаў драўніны. Асн. прынцып Д. — перакрыжаванае датаванне — грунтуецца на непаўторным у часе і амаль аднолькавым характары змен памераў і структуры гадавых кольцаў у большасці дрэў, якія раслі ў падобным клімаце (вузкія кольцы паказваюць на гады засухі, шырокія — на спрыяльныя ўмовы росту).

ДЭНДРАЛАГІ́ЧНЫ САД, тое, што *дэндрарый*.

ДЭНДРАЛО́ГІЯ (ад *дэндра*... + ...*логія*), навука пра дрэвавыя расліны (дрэвы, кусты, кусцікі); раздзел *батанікі*. Вывучае марфалогію, сістэматыку, экалогію раслін, іх выкарыстанне ў нар. гаспадарцы.

Дэндралагічныя даследаванні вядомы са стараж. часоў (*Тэафраст*). У канцы 19 — пач. 20 ст. вял. ролю ў развіцці Д. адыгралі рус. вучоныя І.І.Ляпёхін, С.П.Крашаніннікаў, А.Ф.Мідэндорф, П.С.Палас і інш., батанікі ням. Л.Байснер і Я.Фітшэн, амер. А.Рэдэр, англ. Э.Сарджэнт і інш. У СССР характар даследаванняў па Д. вызначаў У.М.*Сукачоў*, стваральнік геабат. школы, адзін з заснавальнікаў біягеацэналогіі.

На Беларусі пачатак дэндралагічных даследаванняў пакладзены ў 18 ст. Ж.І.*Жыліберам*, які стварыў у Гродне бат. сад з 1200 экзатычнымі раслінамі.

Вывучэннем дрэвавых парод і куставых раслін, стварэннем калекцый займаліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. батанікі А.Рэга, У.У.Адамаў, Дз.М.Нікольскі, Г.М.Высоцкі, С.П.Мельнік. Сучасны этап звязаны з працамі С.Дз.Георгіеўскага, А.Ф.*Іванова*, Б.Дз.Жылкіна, М.Дз.*Несцяровіча*, Я.А.*Сідаровіча*, М.У.*Смольскага*, І.І.Собалева, А.Т.Федарука, А.А.Чахоўскага, М.В.Шкутко і інш. Н.-д. работа вядзецца ў Ін-це эксперым. батанікі і Цэнтр. бат. садзе, Ін-це лесу Нац. АН Беларусі, БДУ, Бел. тэхнал. ун-це, Бел. с.-г. акадэміі. Распрацоўваюцца навук. асновы інтрадукцыі і акліматызацыі дрэвавых раслін. Вывучаны відавы склад мясцовых і інтрадукаваных дрэвавых парод, іх біял. асаблівасці, вызначаны асартымент інтрадукаваных відаў для зялёнага буд-ва і лясной гаспадаркі. Буйнейшая калекцыя дрэвавых раслін сабрана ў Цэнтр. бат. садзе. *А.І.Жорава.*

ДЭНДРА́РЫЙ (ад грэч. dendron дрэва), д э н д р а л а г і ч н ы с а д, калекцыі дрэвавых раслін адкрытага грунту, высаджаных паводле пэўнага прынцыпу (сістэматычнага, геаграфічнага, экалагічнага, дэкаратыўнага і інш.). Можа быць самастойным ці ўваходзіць у склад *батанічнага сада*. Займае пл. ад некалькіх да соцень га. Д. мае навуковае, вучэбнае, культ.-асветнае, даследна-вытв. значэнне: паказвае багацце і разнастайнасць дрэвавай сусв. ці рэгіянальнай флоры, з'яўляецца базай для н.-д. работы па інтрадукцыі, акліматызацыі і селекцыі дрэвава-кустовых раслін, спрыяе пашырэнню рэдкіх і гасп.-каштоўных відаў. Старэйшыя Д. на тэр. СНД у Грузіі ў Тбілісі (1625), у Расіі ў Маскве (1706) і Санкт-Пецярбургу (1714), на Украіне ва Умані (1714; «Сафіеўка»), Белай Царкве (1793—97; «Александрыя»), Харкаве (1804) і Ялце (1812; *Нікіцкі батанічны сад*), а таксама ў Эстоніі ў Тарту (1803) і інш. Буйны Д.— у Гал. бат. садзе АН Расіі (Масква). На Беларусі самы вял. Д. у *Цэнтральным батанічным садзе* Нац. АН Беларусі. Пл. 95,8 га. Закладзены ў 1932 паводле батаніка-геагр. прынцыпу: Беларусь, Д. Усход і Усх. Азія, Паўн. Амерыка, Еўропа і Сібір, Каўказ і Крым, Сярэдняя Азія. Складаецца з геагр. і лесапаркавай тэрыторый. У калекцыях каля 1500 відаў і форм дрэў, кустоў, павойных раслін. Другі па колькасці відаў Д. Бел. с.-г. акадэміі. Пл. каля 15 га. Закладзены ў 1884 як дрэвавы гадавальнік (з канца 1950-х г. дэндралагічны сад). У калекцыях каля 400 відаў дрэў і кустоў. Д. Жорнаўскай лясной доследнай станцыі (Асіповіцкі р-н) створаны ў пач. 20 ст. У калекцыі каля 200 відаў хвойных і лісцевых парод. Віцебскі Д. закладзены ў 1919 паводле геагр. прынцыпу. Збераглося каля 80 відаў. У калекцыях Д. Бел. ун-та (в. Шчомысліца Мінскага р-на), які закладзены ў 1933, каля 330 відаў і форм дрэвавых парод. Д. Бел. тэхнал. ун-та (г.п. Негарэлае Дзяржынскага р-на) закладзены ў 1954 паводле геагр. прынцыпу. У калекцыях больш за 500 відаў і форм дрэвавых парод. Д. Глыбоцкага лясгаса закладзены ў 1968. Мае пл. 8,2 га і калекцыю з 530 відаў дрэвавых раслін. Школьныя Д. ў г.п. Ружаны Пружанскага і в. Валеўка Навагрудскага р-наў. У Д. вывучаецца відавы склад, біял. асаблівасці, развіццё, плоданашэнне, экалогія мясц. і інтрадукаваных парод, вызначаецца асартымент інтрадукаваных відаў для зялёнага буд-ва і лясной гаспадаркі.

Дэндрыты піралюзіту на палявым шпаце.

ДЭНДРЫ́Т (ад грэч. dendron дрэва), крышталічнае ўтварэнне некат. мінералаў, металаў, сплаваў, штучных злучэнняў, якое мае дрэва-, папарце-, моха-, зоркападобную і інш. формы. Утвараецца з расплаву, раствору, пары або газу пры хуткай крышталізацыі рэчыва ва ўмовах сціснутасці росту (напр., у тонкіх трэшчынах, грыфонах — месцах выхаду газавых струменяў), у вязкім, перанасычаным або рыхлым гліністым асяроддзі, пры металургічных працэсах, штучным вырошчванні крышталёў. У прыродзе Д. звычайна — самародная медзь, золата, серабро, таксама лёд, нашатыр, піралюзіт і інш.

ДЭНЕ́Б, α-Л е б е д з я, зорка 1-й *зорнай велічыні* (1,3 візуальнай зорнай велічыні). Свяцільнасць у 51 тыс. разоў большая за сонечную. Адлегласць ад Сонца 500 пс. З *Альтаірам* і *Вегай* утварае т. зв. вял. летні трохвугольнік, добра бачны на летнім небе.

ДЭНЁЎ (Deneuve; сапр. Д а р л е а к; Dorléac) Катрын (н. 22.10.1943, Парыж), французская кінаактрыса. У кіно з 1956. Наіўныя, прастадушныя гераіні фільмаў «Шэрбурскія парасоны» (1964), «Дзяўчаты з Рашфора» (1967), «Асліная шкура» (1970) і інш. саступілі месца складаным, драм. вобразам, поўным разбуральных страсцей у фільмах «Дзённая прыгажуня» (1966), «Трыстана» (1970), «Агіда» (1965), «Сука» (1972). У 1980—90-я г. найб. выпучылася выкананнем гал. роляў у фільмах «Апошняе метро» (1980), «Індакітай» (1991), «Мая любімая пара года» (1992).

ДЭНІ́ (сапр. Д з я н і с а ў) Віктар Мікалаевіч (8.3.1893, Масква — 3.8.1946), рускі графік, карыкатурыст. Засл. дз. маст. Расіі (1932). У 1910-я г. працаваў у гумарыстычных часопісах, з 1921 супрацоўнік газ. «Правда». Паліт. плакатам і карыкатурам Д. ўласціва сатыр.-жанравае вырашэнне тэмы, спалучэнне контурнага малюнка з заліўкай лакальнымі колеравымі плямамі (плакат «Антанта», 1919; малюнкі «На барацьбу з беспрытульнасцю», 1926, карыкатуры часоў Вял. Айч. вайны і інш.).

В.Дэні. Карыкатура часоў Вялікай Айчыннай вайны.

ДЭНІ́ (Denis) Марыс (25.11.1870, г. Гранвіль, Францыя — 3.11.1943), французскі жывапісец. Вучыўся ў Парыжы ў акадэміі Жуліяна (з 1887) і ў Школе прыгожых мастацтваў. Зазнаў уплыў П.Сезана, П.Гагена. Адзін з заснавальнікаў і тэарэтык групы «*Набі*» (1890) і «Майстэрняў рэлігійнага мастацтва» (1919). Лідэр неатрадыцыяналістычнай плыні ў франц. жывапісе. Працаваў у стылях *сімвалізму* і *мадэрну*. Для твораў характэрны манум. формы, дэкар. гармонія, рэліг.-містычныя сюжэты, плоскасная стылізацыя, светлы каларыт. Сярод твораў «Музы» (1893), «Марфа і Марыя» (1896), «Партрэт Івоны Лероль» (1897), «У гонар Сезана» (1900), 11 пано «Гісторыя Псіхеі» (1908—09) і інш. Аўтар кніг «Тэорыі» (1912), «Новыя тэорыі» (1921).

ДЭНІКЕ́Р (Deniker) Жазеф (Іосіф Ягоравіч; 18.3.1852, г. Астрахань, Расія — 18.3.1918), французскі антраполаг. З 1888 бібліятэкар Нац. музея прыродазнаўчай гісторыі ў Парыжы. Стварыў класіфікацыю чалавечых рас (1900), у

якой упершыню паслядоўна праведзены прынцып вылучэння антрапал. тыпаў выключна па фіз. прыкметах; сур'ёзны недахоп гэтай класіфікацыі — адсутнасць гіст. падыходу, што не дае магчымасці прасачыць працэс узнікнення рас.

ДЭНІТРЫФІКА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *нітрыфікацыя*), працэс аднаўлення нітратаў у глебе, вадзе і інш. субстратах да малекулярнага азоту. Адрозніваюць Д. прамую, якая ажыццяўляецца факультатыўнаанаэробнымі мікраарганізмамі — дэнітрыфікатарамі, і ўскосную, пры якой

М.Дэні. Партрэт Івоны Лероль. 1897.

адбываецца хім. ўзаемадзеянне нітратаў з амінійнай соллю, амінамі ці амідамі, што суправаджаецца выдзяленнем газападобнага азоту. Найб. інтэнсіўна Д. ідзе ў глебах з высокай вільготнасцю і дрэннай аэрацыяй, што з'яўляецца адной з асн. прычын страты з глебы мінер. азоту і зніжэння каэфіцыента выкарыстання раслінамі азотных угнаенняў.

ДЭНСІМЕ́ТРЫЯ [ад лац. densus (densi) шчыльны, густы + *...метрыя*], сукупнасць метадаў вымярэння шчыльнасці цвёрдых і вадкіх цел. Для цвёрдых цел у лабараторнай практыцы выкарыстоўваюць *гідрастатычнае ўзважванне*; шчыльнасць вадкасцей вызначаюць *арэометрамі*, *пікнометрамі* і інш. прыладамі; у прам-сці шчыльнасць вымяраюць з дапамогай розных аўтам. шчыльнамераў, прынцып дзеяння якіх заснаваны на бесперапынным узважванні пэўных аб'ёмаў вадкасці, вымярэнні ціску слупа вадкасці пэўнай вышыні, скорасці распаўсюджвання ультрагуку, рассеянні γ-прамянёў і інш.

ДЭНСІТАМЕ́ТРЫЯ (ад лац. densitas шчыльнасць + *...метрыя*), раздзел фатаграфічнай *сенсітаметрыі*, у якім вывучаюцца і распрацоўваюцца метады вымярэння аптычнай шчыльнасці праяўленых фатагр. матэрыялаў. Асобны раздзел Д. складае вымярэнне колерных палёў у мнагаслойных каляровых фатагр. матэрыялах. Прылады Д.: *дэнсітометр* і *мікрафатометр*.

Метады Д. дазваляюць па аптычнай шчыльнасці колькасна ацаніць канчатковы фатагр. эфект (напр., канцэнтрацыю серабра ў пачарненні святлоадчувальнага слоя). Аптычная шчыльнасць павялічваецца з ростам дысперснасці зерняў серабра ў пачарненні; ступень аптычна карыснага выкарыстання серабра тым вышэй, чым большая дысперснасць галоіднага серабра ў зыходным фотаслоі і чым большая была экспазіцыя пры здымцы. Паглынанне святла суправаджаецца яго рассеяннем, таму вынік вымярэння залежыць ад геам. будовы (апертуры) і спектральнага складу пучка.

ДЭНСІТО́МЕТР (ад лац. densitas шчыльнасць + *...метр*), прылада для вымярэння аптычнай шчыльнасці праяўленых фатаграфічных матэрыялаў. Д. адрозніваюць паводле прынцыпу вымярэнняў (прамы адлік і метад параўнання), характару фотапрыёмніка (вока, фотаэлемент ці фотапамнажальнік), характару выхадных даных (нерэгістравальныя і аўтаматызаваныя рэгістравальныя прылады) і па велічыні вымеранага поля (уласна Д. і *мікрафатометры*).

Прынцып работы Д. заснаваны на *Бугера—Ламберта—Бэра законе*. У прыладах прамога адліку выкарыстоўваецца 1 светлавы пучок, зыходная інтэнсіўнасць якога параўноўваецца з інтэнсіўнасцю пучка, што прайшоў праз фотаслой. Прылады, якія працуюць на прынцыпе параўнання, маюць 2 пучкі (вымяральны і параўнання) ад адной крыніцы святла, што паступаюць на 2 фотапрыёмнікі (ці па чарзе на 1). Рознасны сігнал даводзяць да нулявога ўзроўню з дапамогай пераменнага аслабляльніка святла, калібраванага па значэннях аптычнай шчыльнасці.

Дэн Сяапін.

ДЭН СЯАПІ́Н (22.8.1904, прав. Сычуань, Кітай — 18.2.1997), дзяржаўны, паліт. і ваен. дзеяч Кітая. На пач. 1920-х г. вучыўся і працаваў у Францыі. З 1924 чл. Кампартыі Кітая. У 1925—27 вучыўся ў СССР. Удзельнік Вялікага паходу Кітайскай Чырв. арміі (1934—36). У час антыяпонскага супраціўлення (1937—45) кіраваў баявымі аперацыямі. З 1952 неаднаразова займаў пост нам. прэм'ера Дзярж. савета КНР. У 1977—80 нач. Генштаба Народна-вызв. арміі. У 1983—90 Старшыня Цэнтр. ваен. савета КНР (фактычна галоўнакамандуючы арміяй). З 1945 чл. ЦК КПК, у 1956—66 ген. сакратар ЦК партыі. Рэпрэсіраваны ў перыяд «культурнай рэвалюцыі». Пасля 1978 фактычна вызначаў палітыку краіны, быў ініцыятарам курсу на правядзенне эканам. рэформ, буд-ва сацыялізму з кіт. спецыфікай. Вывеў Кітай з руін «культурнай рэвалюцыі», добраахвотнай самаізаляцыі, садзейнічаў прытоку зах. інвестыцый, нармалізацыі адносін Кітая з СССР і ЗША, паставіў краіну на рэйкі рынкавых рэформ ва ўмовах захавання сацыяліст. ідэалогіі і дзярж. кантролю, што прывяло краіну да эканам. буму. У 1990 пакінуў дзярж. пасады, але захаваў ролю духоўнага лідэра КНР. *І.Ф.Раманоўскі.*

ДЭНТЫ́КУЛЫ (ад лац. denticulus зубец), з у б ч ы к і, с у х а р ы к і, у класічнай архітэктуры рад невял. дэкар. выступаў на карнізе ў іанічным карынфскім і адным з варыянтаў рымска-дарычнага ордэраў (гл. *Ордэр* архітэктурны). Правобраз іх — рады тарцоў бэлек-брусоў, што перакрывалі порцік у



Дэнтыкулы.

арх. збудаваннях Стараж. Грэцыі. На Беларусі Д. выкарыстоўвалі як дэкор у культавай і грамадз. архітэктуры сярэдзіны 18—19 ст. (Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, жылыя дамы ў Мінску, Гродне, палац у в. Сноў Нясвіжскага р-на і інш.). Былі пашыраны ў архітэктуры 1950-х г.

ДЭНУДА́ЦЫЯ (ад лац. denudatio аголенне), сукупнасць працэсаў зносу і пераносу з узвышшаў прадуктаў *выветрывання* горных парод (вадой, ветрам, лёдам, сілай цяжару) з наступным іх намнажэннем у паніжэннях рэльефу. На тэмпы і характар Д. ўплываюць размах і хуткасць тэктанічных рухаў. Перавага Д. над эфектам тэктанічных падняццяў прыводзіць да агульнага нівеліравання рэльефу. У выніку працяглай Д. горныя краіны ператвараюцца ў хвалістыя раўніны — *пенеплены*. Тэрмін «Д.» выкарыстоўваецца таксама для абазначэння працэсаў зносу прадуктаў выветрывання шляхам плоскаснага змыву.

ДЭНЦІ́Н [ад лац. dens (dentis) зуб], цвёрдая тканка зуба, што складае яго асн. масу. У Д. зубоў дарослага чалавека 72% мінер. солей, 28% арган. рэчываў. Каронкавая ч. Д. пакрыта эмаллю, ка-

ранёвая — цэментам. Д. пранізаны тонкімі канальцамі, праз якія праходзяць цытаплазматычныя адросткі адантабластаў, дыяметр канальцаў 1—3 мкм, колькасць іх 30—75 тыс. у 1 мм^3. Утварэнне Д. працягваецца і пасля поўнага фарміравання зуба. Пасля прарэзвання зуба ўтвараецца Д. другасны, або замяшчальны, адклады якога павялічваюцца пры павышаным сціранні эмалі, развіцці *карыеса зубоў*. *А.С.Арцюшкевіч.*

ДЭПАЗІ́Т (ад лац. depositum рэч, аддадзеная на захаванне), 1) грашовыя сродкі або каштоўныя паперы, якія змяшчаюцца для захавання ў крэдытныя ўстановы. Тэрміновы Д. належыць вяртанню па сканчэнні пэўнага тэрміну, бестэрміновы — па першым патрабаванні ўкладчыка. Дакументам, які сведчыць аб дэпаніраванні грашовых сродкаў у крэдытнай установе юрыд. асобай, з'яўляецца дэпазітны сертыфікат. 2) Грашовая сума або каштоўныя паперы, якія ўносяцца даўжніком у суд. ўстановы для перадачы крэдытору (напр., у забеспячэнне іску) і адм. ўстановы (напр., узнос у натарыяльную кантору кватэрнай платы ў выпадку спрэчкі аб яе памеры). 3) Сума грошай, якая ўяўляе сабой абумоўленую частку агульнай вартасці ф'ючэрснага кантракта (гл. ў арт. *Ф'ючэрс*) або цвёрдую суму, якая павінна быць аплачана членам біржы разліковай палаты, а кліентамі — брокеру, калі кантракт рэгіструецца.

ДЭПАЗІТА́РЫЙ (франц. dépositaire), 1) фізічная або юрыд. асоба, якой перадаюцца каштоўнасці для захавання без пераходу да яго права ўласнасці. 2) Дзяржава або міжнар. арг-цыя, што захоўвае арыгінальны тэкст міжнар. дагавора, дакументы пра яго ратыфікацыю і інш.

ДЭПАЗІ́ТНЫЯ АПЕРА́ЦЫІ, аперацыі крэдытных устаноў, банкаў па прыцягненні грашовых сродкаў у выглядзе ўкладаў і размяшчэнне гэтых укладаў; крэдытаванне грашовых сродкаў за кошт атрыманых *дэпазітаў*.

ДЭПАЛЯРЫЗА́ЦЫЯ СВЯТЛА́, змяншэнне ступені *палярызацыі святла*. Назіраецца ў многіх аптычных з'явах, напр., пры рассейванні святла ў мутным асяроддзі або на матавай паверхні. Пры штучнай Д.с. палярызаванае святло змяняе стан палярызацыі ў часе, па папярочным сячэнні пучка або па спектры.

ДЭПАНЕ́НТ [ад лац. deponens (deponentis) той, хто адкладвае], фізічная або юрыд. асоба, якая ўнесла каштоўнасці ў дэпазіт крэдытнай установы. Д. з'яўляюцца таксама фіз. асобы, якія не атрымалі своечасова зарплату, ганарар, і асобныя арг-цыі і асобы, на карысць якіх зроблены ўтрыманні з зарплаты (аліменты і інш.).

ДЭПАПУЛЯ́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *папуляцыя*), памяншэнне колькасці папуляцыі віду жывых арганізмаў пад уплывам прыродных або антрапагенных фактараў. У адносінах да раслін — зрэджванне. У асобных краінах назіраюцца сімптомы чалавечай Д.

ДЭПАРДЗЬЁ (Depardieu) Жэрар Ксаўе (н. 27.12.1948, г. Шатару, Францыя), французскі кінаакцёр. Скончыў курсы драм. мастацтва Ш.Дзюлена і Школу драм. мастацтва Ж.Л.Кашэ. У 1969—73 у аматарскай групе «Кафэ дэ ла гар». З 1968 у т-ры «Шаё». З 1966 у кіно. Пачынаў з роляў праставатых і цынічных хлопцаў, потым праявіў сябе як майстар псіхал. партрэта. У фільмах «Дваццатае стагоддзе», «Жанчына з Ганга», «Суседка», «Апошняе метро», «Дантон», «Пад сонцам Сатаны», «Сірано дэ Бержэрак» і інш. раскрывае складаныя ўнутр. жыццё сваіх герояў.

ДЭПАРТА́МЕНТ (франц. département), 1) асноўная адм.-тэр. адзінка ў Францыі і шэрагу інш. краін. 2) У Рас. імперыі і ў некат. замежных краінах Д. — аддзел вышэйшай адм. або суд. установы; адм. падраздзяленне ў апараце некат. міжнар. арг-цый (напр., ААН). 3) У некаторых дзяржавах, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь, — назва ведамства, мін-ва; дзяржаўны Д. — мін-ва замежных спраў ЗША.

ДЭПАРТА́ЦЫЯ (лац. deportatio), прымусовае высяленне, выгнанне асобы з пастаяннага месца жыхарства або з краіны, *ссылка* з пасяленнем яе ў новым месцы з абмежаваннем свабоды перамяшчэння. Тэрмінам «Д.» абазначаліся асобыя віды высялення, якія выкарыстоўваліся ў 18—19 ст. паводле крымін. заканадаўства Францыі ў адносінах да злачынцаў-рэцыдывістаў і рэвалюцыянераў. У СССР у 1920—40-я г. прымусовае высяленне ў Сібір, Казахстан, раёны Крайняй Поўначы, на Урал і інш. аддаленыя рэгіёны краіны грамадзян, якія былі прызнаны ворагамі сав. улады. У 1930-я г. ў час правядзення суцэльнай калектывізацыі ссылку зведалі многія сялянскія сем'і, якія былі прылічаны да кулацкіх і высланы ў глыб дзяржавы. У 1931—34 з БССР было выслана каля 260 тыс. чал. З лют. 1940 у БССР пачалася масавая Д. насельніцтва (пераважна польскага) з Зах. Беларусі. Да 22.6.1941 у зах. абласцях Беларусі было рэпрэсіравана больш за 135 тыс. чал., з іх выслана ў глыб СССР больш за 125 тыс. У час Вял. Айч. вайны 1941—45 у СССР у тыл краіны было дэпартавана насельніцтва некалькіх аўтаномных тэрыторый — крымскія татары, калмыкі, карачаеўцы, інгушы, немцы Паволжа, чэчэнцы і інш., абвінавачанае ў супрацоўніцтве ці дапамозе ням.-фаш. захопнікам. У 2-й пал. 1950—80-х г. большасць ахвяр Д. рэабілітавана, а выселеныя народы вернуты на сваю радзіму.

Літ.: Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20—50-ых гадоў на Беларусі. Мн., 1994; Яго ж. Абвінавачваюць лічбы: Гістарыяграфія і крыніцы па праблеме паліт. рэпрэсій 1920—1950-х гг. на Беларусі // Бел. мінуўшчына. 1997. № 5; Парсаданова В.С. Депортация населения из Западной Украины и Западной Белоруссии в 1939—1941 гг. // Новая и новейшая история. 1989. № 2; Хацкевіч А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939—1941 гг.) // Бел. гіст. часоп. 1994. № 1—2. *А.Ф.Хацкевіч.*

ДЭПЕРЭ́ ПРА́ВІЛА, філагенетычнага росту закон, эмпірычнае абагульненне даных аб характары гіст. развіцця асобных сістэматычных груп. Сфармуляваў франц. вучоны Ш.Дэперэ (1907). Паводле Д.п., у кожнай філагенетычнай лініі назіраецца тэндэнцыя да павелічэння памераў цела арганізмаў або гіст. развіццё ідзе ад дробных продкавых груп да ўсё буйнейшых. Пасля дасягнення крытычных памераў і парушэння асн. прапорцый цела адбываецца выміранне групы. Д.п. ўзводзіць асобныя філагенетычныя з'явы ў ранг агульнай эвалюц. заканамернасці і заснавана на прызнанні ўнутр. тэндэнцыі развіцця, незалежнай ад матэрыяльных узаемадзеянняў. Зрэдку Д.п. называюць і закон прагрэсіруючай спецыялізацыі (сфармуляваны Дэперэ), паводле якога група арганізмаў, што стала ў працэсе эвалюцыі на шлях спецыялізацыі, непазбежна павінна ісці да ўсё больш глыбокай і вузкай спецыялізацыі, у выніку чаго вымірае.

ДЭПЕ́ША (франц. dépêche), 1) спешнае паведамленне (дыпламат., ваен. і інш.). 2) Тэлеграма.

ДЭПО́ (франц. dépôt літар. склад, сховішча), прадпрыемства і спецыяльна абсталяваны будынак для стаянкі, абслугоўвання і рамонту рухомага саставу чыгунак (лакаматыўныя і вагонныя Д.), гар. наземнага (трамвайныя і тралейбусныя Д.) і падземнага (Д. метрапалітэна) электратранспарту, а таксама пажарных машын і прыстасаванняў (пажарнае Д.). Для рухомага саставу гар. транспарту ўжываецца таксама назва парк (аўтобусны, тралейбусны, трамвайны паркі).

ДЭПОЛІМЕРЫЗА́ЦЫЯ, гл. ў арт. *Дэструкцыя палімераў*.

ДЭПРЭ́СІЯ (ад лац. depressio прыгнечанне, падаўленне) у псіхалогіі, афектыўны стан, які характарызуецца адмоўным эмацыянальным фонам, змяненнем матывацыйнай сферы і агульнай пасіўнасцю паводзін. Чалавек у стане Д. суб'ектыўна адчувае цяжкія, пакутлівыя эмоцыі і перажыванні (прыгнечанасць, тугу, смутак, роспач). Характэрнымі з'яўляюцца думкі пра ўласную адказнасць за розныя непрыемныя, цяжкія падзеі ў асабістым жыцці або ў жыцці блізкіх людзей. Валявая актыўнасць, самаацэнка рэзка зніжаны. Адрозніваюць функц. стан Д., магчыма ў здаровых людзей у межах нармальнага псіхічнага функцыянавання, і паталаг. Д. як адзін з асн. псіхіятрычных сіндромаў.

ДЭПРЭ́СІЯ ў м е д ы ц ы н е, псіхічная прыгнечанасць з затарможанасцю мыслення, мовы і рухаў. Бывае пры псіхічных і саматычных хваробах, найб. тыповая ў дэпрэсіўнай фазе *маніякальна-дэпрэсіўнага псіхозу*. Прыкметы: паніжаны настрой (гіпатымія) да глыбокай тугі з трызненнем, нерухомасцю, самаабвінавачваннем. Д. трэба адрозніваць ад звычайнай (фізіял.) рэакцыі чалавека пры непрыемных перажываннях, жыццёвых няўдачах і псіхічных траўмах. Лячэнне: псіхатропныя сродкі, электрасутаргавая тэрапія, псіхатэрапія, хворых на цяжкую Д. лечаць у стацыянарах.

ДЭПРЭ́СІЯ ў б і я л о г і і, рэзкае паніжэнне колькасці асобін папуляцыі або віду. Можа быць выклікана зменамі клімату ці інш. абіятычнымі фактарамі, біяцэнатычнымі ўзаемаадносінамі (напр., зніжэнне колькасці ахвяр у выніку павелічэння колькасці драпежнікаў) або ўнутрыпапуляцыйнымі з'явамі (стрэс, эміграцыя і інш.). Тэрмін Д. не прынята ўжываць, калі зніжэнне колькасці асобін адбываецца ў выніку прамога ўздзеяння чалавека. Звычайна Д. мае часовы, нярэдка цыклічны характар (напр., рэгулярныя Д. колькасці лемінгаў у біяцэнозах тундры), аднак у некат. выпадках прыводзіць да поўнага вымірання папуляцыі або віду. Каб прадухіліць іх выміранне, часта патрабуюцца спец. меры аховы. *В.В.Грычык.*

ДЭПУТА́Т (ад позналац. deputatus упаўнаважаны), асоба, выбраная ў прадстаўнічы орган дзяржавы ці орган мясц. самакіравання; паўнамоцны прадстаўнік пэўнай часткі насельніцтва — выбаршчыкаў свайго выбарнага органа або ўсёй нацыі. Д. працуе ў адпаведным прадстаўнічым органе на прафес. (у большасці дэмакр. дзяржаў) або непрафес. аснове, г. зн. не парываючы з асн. дзейнасцю. Статус Д. ўстанаўліваецца канстытуцыяй і спец. законамі. Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь паўнамоцнымі прадстаўнікамі ў органах дзярж. улады з'яўляюцца Д. *Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь* і Д. *мясцовых Саветаў дэпутатаў*. Яго паўнамоцтвы пачынаюцца з дня выбрання і заканчваюцца ў дзень выбрання Д. новага склікання або датэрмінова ў адпаведнасці з заканадаўствам. Д. забяспечваюцца ўмовамі для бесперашкоднага і эфектыўнага ажыццяўлення сваіх правоў і абавязкаў, маюць пэўныя льготы і карыстаюцца дэпутацкай недатыкальнасцю (гл. *Імунітэт*). Пры неабходнасці Д. можа быць адкліканы сваімі выбаршчыкамі. Адкліканне Д. ажыццяўляецца на падставах, прадугледжаных законам. *В.А.Кадаўбовіч.*

ДЭПУТА́ЦКАЯ НЕДАТЫКА́ЛЬНАСЦЬ, гл. ў арт. *Імунітэт*.

ДЭРАТЫЗА́ЦЫЯ (ад *дэ*... + франц. rat пацук), комплекс мерапрыемстваў па знішчэнні шкодных грызуноў (пацукоў, мышэй, суслікаў, суркоў і інш.). Прафілактычная Д. накіравана на пазбаўленне грызуноў корму і пітця, а таксама месцаў для наладжвання нораў і гнёздаў. Знішчальную Д. праводзяць механічнымі (пасткі, петлі), біял. (бактэрыяльныя культуры, драпежнікі) і хім. метадамі.

ДЭРБЕ́НТ, горад, райцэнтр у Дагестане Рас. Федэрацыі. 82 тыс. ж. (1992). Порт на Каспійскім м., чыг. станцыя на лініі Махачкала—Баку. Прам-сць: маш.-буд. (электратэхн. абсталяванне, шліфавальныя станкі), харч. (кансервы, віно, каньяк), лёгкая (воўнапрадзенне, дываны), буд. матэрыялаў.

Пасяленні на тэр. Д. ўзніклі ў 8—6 ст. да н.э. Верагодна, уваходзіў у склад *Албаніі Каўказскай*, у 4 ст. да н.э. — дзяржавы *Сасанідаў*. У 6 ст. Д. — адзін з найважнейшых ваен.-стратэгічных пунктаў на Каўказе. У канцы 6 — пач. 7 ст. прадмет спрэчак паміж Арабскім халіфатам і Хазарскім каганатам, неаднаразова пераходзіў з рук у рукі. У 8—13 ст. буйны гандл. цэнтр і порт на Каспіі. У 10 ст. ў горадзе правіла дынастыя Хашымідаў. У 1239 завяваны мангола-татарамі, прыйшоў у заняпад. У 16 — пач. 18 ст. ўваходзіў у склад Персіі (у 1578—1606 захоплены туркамі). У 1722 заняты рус. войскамі. Паводле *Гянджынскага трактата 1735* вернуты Персіі. З 1747 сталіца Дэрбенцкага ханства. У 1806 паводле *Гюлістанскага мірнага дагавора 1813* далучаны да Рас. імперыі. З 1840 павятовы, у 1846—60 губернскі горад, да 1866 цэнтр Дагестанскай вобл.

ДЭ́РБІ (Derby), горад у цэнтр. Вялікабрытаніі, на З ад г. Нотынгем, на р. Дэруэнт. 227,1 тыс. ж. (1992). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: маш.-буд. (авіярухавікі, інш. галіны трансп. машынабудавання), тэкст. (тканіны баваўняныя, шаўковыя, з хім. валокнаў), трыкат., гарбарная, фарфоравая. Вытв-сць карункаў. Арх. помнікі 14—19 ст. (царква Сент-Пітэр, Зала сходаў, сабор). Маст. галерэя.

ДЭ́РВІШ, д а р в і ш (перс. літар. бядняк, жабрак), член мусульм. містычнага брацтва, суфій (гл. *Суфізм*). Сяліліся ў суфіцкіх манастырах як вандроўныя аскеты (факіры), жылі з міласціны. Брацтвы Д., заснаваныя на вучэнні суфізму, узніклі ў 11—13 ст., асабліва пашыраны ў Іране і Сярэдняй Азіі. Гал. прынцыпы Д. — беднасць, аскетызм і поўнае прысвячэнне Богу, гал. мэта — містычнае ўз'яднанне з Богам, якога імкнуліся дасягнуць шляхам рытуальнай малітвы, у некаторых брацтвах спалучанай з экстатычным танцам або акампанементам муз. інструментаў. *Н.К.Мазоўка.*

ДЭ́РМА (ад грэч. derma скура), злучальнатканкавая частка скуры пазваночных жывёл і чалавека, якая знаходзіцца пад эпідэрмісам; уласна скура. Развіваецца з мезадэрмы. Д. вял., ці малая рухома злучана з органамі, што ляжаць ніжэй, падскурнай рыхлай злучальнай тканкай, часта багатай тлушчавымі адкладамі. Складаецца з 2 слаёў: паверхневага сасочкавага (мае сасуды, забяспечвае жыўленне эпідэрмісу і яго вытворных) і сеткаватага (выконвае апорную функцыю).

ДЭРМАГРАФІ́ЗМ (ад *дэрма* + грэч. graphō пішу), змена афарбоўкі скуры пры мех. яе раздражненні. Адрозніваюць Д. белы (палосы пры раздражненні белага колеру), узвышаны (палосы чырв. колеру, узвышаныя над скурай і доўга не знікаюць), чырвоны (палосы чырв. ці ружовага колеру), разліты (палосы выходзяць за межы ўчастка, які раздражнялі), рэфлектарны (шырокая паласа з чырв. і белых плям), уртыкальны (на месцы раздражнення пухіры), мясцовы (толькі месца штрыхавога раздражнення). Мае дыягнастычнае значэнне.

ДЭРМАТА... [ад грэч. derma (dermatos) скура], першая састаўная частка складаных слоў, што абазначае: які адносіцца да скуры, скурных захворванняў, напр., *дэрматалогія*, *дэрматаміязіт*.

ДЭРМАТАГЕ́Н (ад *дэрмата*... + ...*ген*), вонкавы шчыльны (без міжклетнікаў) слой клетак першаснай утваральнай тканкі (*мерыстэмы*) у кончыках каранёў пакрытанасенных раслін. Утварае *эпіблему* з каранёвымі валаскамі. У двухдольных удзельнічае ў фарміраванні каранёвага чахольчыка. На верхавінках паветраных каранёў архідных, ароідных і некат. інш. раслін Д. утварае мнагаслойную тканку (т. зв. веламен), якая збірае ваду. У голанасенных раслін функцыю Д. выконвае *пратадэрма*.

ДЭРМАТАГЛІ́ФІКА (ад *дэрмата*... + грэч. glyphō гравірую), навука пра скурныя малюнкі далоней і падэшваў у чалавека і некат. малпаў. Тэрмін прапанаваны амер. вучонымі, афіцыйна зацверджаны ў 1926. Мае некалькі кірункаў. Э т н і ч н а я Д. вывучае характар і прычыны зменлівасці скурных малюнкаў у розных рас і народаў, яе даныя шырока выкарыстоўваюць для праверкі гіпотэз па сістэматызацыі рас і паходжанні асобных народаў. Г е н е т ы ч н ы кірунак у Д. вывучае механізм перадачы па спадчыннасці папілярных (сасочкавых) малюнкаў, магчымасці выкарыстання іх як дыягнастычнага тэста пры спадчынных хваробах. А н а т а м і ч н ы кірунак вывучае сувязі скурных малюнкаў з сасудзістым пучком і нерв. адросткамі, а таксама ўзнікненне ў плода скурных малюнкаў (морфагенез). Даследаваннямі ўстаноўлена, што асн. віды малюнкаў — петлі, завіткі і дугі паяўляюцца на 17-м тыдні эмбрыянальнага развіцця, а ў 5-месячнага плода назіраецца ўстойлівы тып сігнальных барознаў і скурных малюнкаў, які на працягу далейшага жыцця не мяняецца, а пасля неглыбокіх раненняў аднаўляецца. У суд. медыцыне (*дактыласкапія*) скурныя малюнкі выкарыстоўваюць для ідэнтыфікацыі асобы.

Літ.: Т е г а к о Л.И. Дерматоглифика населения Белоруссии: Популяционные аспекты изменчивости. Мн., 1989. *Л.І.Цягака.*

ДЭРМАТАЛО́ГІЯ (ад *дэрмата*... + ...*логія*), раздзел клінічнай медыцыны, які вывучае функцыі і структуру скуры ў

норме і пры паталогіі, распрацоўвае метады дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі хвароб скуры. Адрозніваюць агульную (вывучае анатомію, гісталогію, фізіялогію, біяхімію здаровай і хворай скуры, агульныя заканамернасці развіцця скурных хвароб) і прыватную Д. (даследуе асобныя дэрматозы). Цесна звязана з інш. галінамі клінічнай медыцыны, асабліва з *венералогіяй*.

Захворванні скуры са старажытнасці вядомы народам Егіпта, Кітая, Індыі, Грэцыі, Рыма. Аднак Д. як навука сфарміравалася ў 2-й пал. 18 — пач. 19 ст., пасля стварэння аўстр. ўрачом І.Пленкам і пазней англ. урачом Р.Уіленам першапачатковай класіфікацыі хвароб скуры, заснаванай на марфал. прынцыпе (паводле знешніх праяўленняў хвароб). Пачалі фарміравацца дэрматалагічныя школы. У 2-й пал. 19 ст. Д. аб'ядналася з венералогіяй у адну мед. дысцыпліну — дэрматавенералогію. Заснавальнікі Д. ў Расіі — А.Г.Палацебнаў, Ц.П.Паўлаў, А.І.Паспелаў, П.В.Нікольскі — развівалі фізіял. кірунак у Д., зыходзячы з уяўленняў аб цеснай сувязі скуры з цэласным арганізмам.

На Беларусі даследаванні па Д. пачаліся ў 19 ст. Станаўленне і развіццё Д. як навукі звязана з заснаваннем кафедры дэрматавенералогіі на мед. ф-це БДУ (1923) і дзейнасцю кафедраў у Віцебскім і Гродзенскім мед. ін-тах, бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, стварэннем скурна-венералагічнага НДІ (1932—88). Даследаванні па Д. вядуцца ва ўсіх мед. ВНУ краіны, у рэсп. кансультацыйна-дыягнастычным цэнтры па Д. і венералогіі пры Мінскім скурна-венералагічным дыспансеры. Поспехі айчыннай Д. ў дыягностыцы, лячэнні і прафілактыцы піядэрмітаў, кароста, псарыязу і інш. дэрматозаў звязаны з імёнамі А.Я.*Пракапчука*, А.Ц.*Сасноўскага*, Л.І. *Гакінаевай*, А.П.*Комава*, Я.С.Пеўзнера, Л.І.*Багдановіча*, М.З.*Ягоўдзіка*, Л.Г.*Барабанава* і інш. бел. вучоных.

Літ.: Скрипкин Ю.К. Кожные и венерические болезни. М., 1980; Дифференциальная диагностика кожных болезней. М., 1983.

Л.Г.Барабанаў.

ДЭРМАТАМІКО́ЗЫ, гл. *Грыбковыя хваробы скуры.*

ДЭРМАТАМІЯЗІ́Т (ад *дэрмата...* + *міязіт*), сістэмнае пашкоджанне папярочна-паласатай і гладкай мускулатуры з парушэннем рухальнай функцыі, а таксама скуры, пераважна на адкрытых участках цела. Вял. значэнне ва ўзнікненні хваробы надаецца алергічным і аўтаімунным механізмам: Д. бывае вострым (ліхаманка з дрыжыкамі, хутка нарастае генералізаванае пашкоджанне шкілетнай мускулатуры), падвострым (цячэнне хваробы маруднае) і хранічным. Прыкметы: пашкоджанне шкілетных мышцаў (хворы не можа самастойна ўставаць, садзіцца, падняць нагу, трымаць прадмет у руцэ, падае пры хадзе), парушаецца глытанне, на адкрытых участках скуры развіваецца эрытэма, ацёк, вузельчыкі, пухіркі, кровазліццё, узмацненне ці аслабленне пігментацыі, пачырваненне скуры (найчасцей вакол вачэй, носа, на шчоках), развіваецца сухасць скуры, ломкасць пазногцяў, выпаданне валасоў. Лячэнне: агульнаўмацавальная і дэзінтаксікацыйная тэрапія, гармональныя прэпараты, імунасупрэсары. *М.З.Ягоўдзік.*

ДЭРМАТО́ЗЫ [ад *дэрма* + *...оз*(ы)], прыроджаныя і набытыя паталаг. працэсы ў скуры і яе прыдатках (валасах, пазногцях). Вядома каля 2000 Д. Выклікаюцца экзагеннымі (хім., фіз., біял.) і эндагеннымі (ачаговыя інфекцыі, агульныя інфекц. хваробы, інтаксікацыі) прычынамі, парушэннямі абмену рэчываў, функцыі залоз унутр. сакрэцыі, крова- і лімфазвароту, пашкоджаннем нерв. сістэмы, нястачай вітамінаў. Прыроджаныя Д. бываюць пры інтаксікацыях, інфекцыях, парушэннях кровазвароту плода ва ўлонні маці. Д. пашкоджваюць увесь арганізм або асобныя органы і сістэмы. Лячэнне агульнае (прычыннае) і мясцовае (сімптаматычнае). Гл. таксама *Высыпка*. *М.З.Ягоўдзік.*

ДЭРМАТЫ́Т (ад *дэрма* + *...іт*), запаленне скуры. Узнікае ад дзеяння на скуру фіз. (доўгае трэнне і ціск, высокія і нізкія т-ры, радыяцыя), хім. (к-ты, солі, лек. прэпараты, касметыка і інш.), раслінных фактараў. Штучныя Д. бываюць ад уздзеяння раздражняльнікаў, алергічныя — ад паўторных уздзеянняў раздражняльнікаў, якія выклікаюць сенсібілізацыю арганізма. Адрозніваюць Д. вострыя і хранічныя. Прыкметы: пачырваненне і ацёк, пухіры, боль, сверб, пякота. Лячэнне: ліквідацыя прычын, што выклікаюць хваробу, мясцовае — процізапаленчыя сродкі. *М.З.Ягоўдзік.*

ДЭРМАЦІ́Н (ад грэч. dermatinos скураны), баваўняная тканіна з пакрыццём з нітрацэлюлозы (гл. *Нітраты цэлюлозы*) на адным ці абодвух баках; штучная скура. Выкарыстоўваюць для абіўкі мэблі, пераплёту кніг і інш.

ДЭРМАЦЭ́НТАР (Dermacentor), род іксодавых кляшчоў атр. паразітыформных. 30 відаў. Пашыраны ў Паўн. Амерыцы, Еўразіі (акрамя паўд.-зах. ч. Аравійскага п-ва, Індастана, Індакітая), Паўн. Афрыцы. Жывуць пераважна ў стэпах, лясах, пустынях. Пераносчыкі ўзбуджальнікаў шэрагу небяспечных хвароб. Гаспадары — млекакормячыя, зрэдку птушкі. На Беларусі 2 віды: Д. pictus і Д. marginatus.

Даўж. цела ў галодным стане 2—8,5 мм. Характэрны для ўсіх відаў белы эмалевы малюнак на спінным шчытку. Развіццё Д. адбываецца па трохгаспадаровым цыкле. Працягласць развіцця 1, зрэдку 2 гады.

Г.Г.Дабецкая.

ДЭРМО́ІД (ад *дэрма* + грэч. eidos выгляд), дэрмоідная кіста, пухлінападобнае ўтварэнне, што ўзнікае пры парушэннях *эмбрыягенезу* з эктадэрмы і мезадэрмы, а таксама ў працэсе жыццядзейнасці з функцыянальных элементаў скуры — потавых і тлушчавых залоз, валасяных фалікулаў. Разнавіднасць *тэратомы*. Бывае ў розных участках цела, найчасцей на скуры галавы, вельмі рэдка ва ўнутр. органах, галаўным мозгу і яго абалонках. Поласць Д. запоўнена жэле- ці тлушчападобным масай з валасамі, касцявымі структурамі, зубамі і інш. тканкамі. Пры росце Д. з'яўляецца боль, іншы раз запаленне тканкі і скуры вакол яго. Магчыма развіццё з Д. пласкаклетачнага рака. Лячэнне хірургічнае. *В.Я.Рабека.*

ДЗ́ЭРПЦКАЕ ЕПІ́СКАПСТВА, феадальная дзяржава ў *Лівоніі* (тэр. паўд.-ўсх. ч. сучаснай Эстоніі з г. Тарту). Засн. ў 1224 рыжскім епіскапам Альбертам, які ўзначаліў агрэсію ням. крыжакоў у Прыбалтыку. На чале стаяў каталіцкі епіскап, буйны феадал-землеўладальнік. Феад. ўсобіцы, а таксама *Рэфармацыя* ў пач. 16 ст. аслабілі Д.е., і на пач. *Лівонскай вайны 1558—83* яно перастала існаваць.

ДЗ́ЭРПЦКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, гл. *Тартускі універсітэт.*

ДЭРЫВА́ЦЫЯ (ад лац. derivatio адвядзенне, адхіленне), 1) у гідратэхніцы — сукупнасць абходных вадаводаў, па якіх вада з ракі, вадасховішча ці інш. вадаёма падводзіцца да станцыйнага вузла ГЭС, помпавай станцыі (пры ірыгацыі), інш. аб'ектаў, а таксама адводзіцца ад іх. Бывае безнапорная (каналы, безнапорныя тунэлі, латакі) і напорная (трубаправоды, напорныя тунэлі). Д. энергетычная будуецца з нахілам, значна меншым за нахіл ракі, — каб рознасць гідраўлічных нахілаў вадавода і ракі стварыла напор, неабходны для работы гідратурбін (гл. *Гідраэлектрычная станцыя*). 2) У балістыцы — сістэматычнае бакавое адхіленне снарадаў і куль ад плоскасці стральбы (праходзіць вертыкальна праз вось канала ствала) пад уплывам уласнага вярчэння, супраціўлення паветра і сілы цяжару. Большае з павелічэннем далёкасці стральбы, стромкасці траекторыі і скорасці вярчэння снарада (кулі). Улічваецца пры падрыхтоўцы да стральбы з дапамогай спец. табліц.

ДЭРЫВА́ЦЫЯ ў моваznаўстве, гл. ў арт. *Словаўтварэнне.*



Дэрывацыя снарада: 1, 2, 1′, 2′ — траекторыя і яе праекцыі; 3, 4 — дэрывацыя на траекторыі і ў пункце падзення; O, C — пункты вылету і падзення снарада; δ — вугал атакі; ω — вуглавая скорасць вярчэння снарада.

ДЭРЭ́ГУС Міхаіл Гардзеевіч (5.12.1904, с. Вясёлае Харкаўскай вобл., Украіна — 31.7.1997), украінскі жывапісец і графік. Нар. мастак СССР (1963), чл.-кар. АМ СССР (1958). Вучыўся ў Харкаўскім маст. ін-це (1923—30). Сярод твораў: цыклы афортаў «Па дарогах Украіны» (1941), «Па дарогах вайны» (1941—42), «Вяртанне» (1943—44), «Украінскія народныя думы і гістарычныя песні» і «Маруся Багуслаўка» (абодва 1947); трыпціх «Дума пра казака Галоту» (1960), цыкл «Стэп» (1970—80-я г.). Аўтар ілюстрацый да твораў І.Катлярэўскага, М.Гогаля, Т.Шаўчэнкі, Л.Талстога і інш. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1969.

Літ.: Врона І.М. Дерегус. Київ, 1958; М.Дерегус. Офорты: [Альбом]. Киев, 1971.

М.Дэрэгус. Маруся Багуслаўка. 1947.

ДЭРЭ́Н (Derain) Андрэ (10.6.1880, Шату, каля Парыжа — 8.9.1954), французскі мастак. Вучыўся ў Э.Кар'ера (1898—99) і ў акадэміі Жуліяна (1904) у Парыжы. У 1900—07 пісаў пейзажы ў духу фавізму і тэхніцы, блізкай да А.Матыса («Тэмза каля Лонданскага моста», 1900). Каля 1908 стыль Д. змяніўся пад уплывам П.Сезана і ранняга кубізму («Купальшчыцы», 1908, «Від Кадака», 1910). Музейная культура, да якой меў схільнасць Д., абумоўлівала ў яго творах рысы эклектызму і іх падабенства да Г.Курбэ і А.Рэнуара (выявы аголеных), К.Каро і мастакоў барбізонскай школы (пейзажы), Ж.А.Энгра, візант., ісп., венецыянскага жывапісу (партрэты). Рабіў тэатр. дэкарацыі і касцюмы, што ўплывала і на яго жывапісныя работы («П'еро і Арлекін», 1924). Аўтар ілюстрацый у тэхніцы дрэварыту да твораў Г.Апалінэра, А.Брэтона і інш.

Літ.: Калитина Н.Н. А.Дерен. М., 1976.

ДЭСАЛІ́Н (Dessalines) Жан Жак (20.9.1758, Гана — 17.10.1806), дзеяч нац.-вызв. руху на в-ве Гаіці. Пажыццёвы ген.-губернатар (з 1804). Негр, да 1790 раб (узяў прозвішча свайго б. ўладальніка). Удзельнік нац.-вызв. паўстання пад кіраўніцтвам Ф.Д.*Тусэн-Луверцюра*, пасля паланення якога французамі (1802) на чале арміі паўстанцаў (з мая 1803) дамогся вызвалення в-ва ад франц. каланізатараў (канец 1803). З кастр. 1804 імператар Гаіці (правіў як Жак I). Цяжкае эканам. становішча краіны (у т.л. з-за блакады вострава Францыяй, а з 1806 і ЗША), агр. палітыка (перадача дзярж. зямель пераважна ва ўладанне неграм) і жорсткія метады праўлення Д. выклікалі ў кастр. 1806 паўстанне землеўладальнікаў-мулатаў, у час якога Д. загінуў.

ДЭСА́НТ (франц. descente літар. спуск, высадка), войскі, спецыяльна падрыхтаваныя для высадкі (выкідання) на тэрыторыю праціўніка або высаджаныя (выкінутыя) на ёй з мэтай вядзення баявых дзеянняў. У залежнасці ад характару пастаўленых задач, глыбіні высадкі і колькаснага складу войск Д. бываюць аператыўна-стратэгічныя, аператыўныя, аператыўна-тактычныя, тактычныя, спец. прызначэння і дэманстратыўныя; паводле сродкаў і спосабаў перакідкі войск — марскія, паветраныя і камбінаваныя. Вылучаюць таксама Д. карабельныя і танкавыя.

Паветраныя Д. бываюць парашутныя (*паветрана-дэсантныя войскі* і тэхніка выкідваюцца з ваенна-транспартных самалётаў на парашутах), пасадачныя (высаджваюцца з самалётаў, верталётаў і планёраў, якія прызямляюцца ў тыле праціўніка) і камбінаваныя. Марскія Д. перавозяцца на спец. дэсантных караблях і трансп. суднах, высаджваюцца на бераг, на захопленыя прычалы або з дапамогай дэсантна-высадкавых сродкаў і верталётаў. Першымі звычайна высаджваюцца часці *марской пяхоты*. *Ф.Р.Каламоец.*

ДЭ СА́НТЫС (De Santis) Джузепе (н. 11.2.1917, г. Фонды, Італія), італьянскі кінарэжысёр. Скончыў Рымскі ун-т (1939), вучыўся ў Рымскім кінацэнтры. У яго творчасці неарэалістычныя тэндэнцыі сац. драм «Трагічнае паляванне» (1947), «Горкі рыс» (1949), «Няма міру пад алівамі» (1950) па-мастацку пераканаўча раскрыліся ў фільме «Рым, 11 гадзін» (1952). Сярод інш. фільмаў: «Дайце мужа Ганне Дзакеа» (1953, у пракаце «Страчаныя мроі»), «Яны ішлі на Усход» (1964, сав.-італьян.), «Цэнны спецыяліст з забяспечанай будучыняй» (1972). У лепшых фільмах страснасць, рамантычная прыўзнятасць спалучаюцца з каларытнымі замалёўкамі нар. жыцця.

ДЭ́САЎ (Dessau) Паўль (19.12.1894, г. Гамбург, Германія — 28.6.1979), нямецкі кампазітар, дырыжор, скрыпач. Чл. Ням. акадэміі мастацтваў (1950), у 1957—62 яе віцэ-прэзідэнт. З 11 гадоў выступаў як скрыпач-віртуоз. У 1910—12 вучыўся ў кансерваторыі Кліндварта—Шарвенкі (Берлін). З 1912 канцэртмайстар і дырыжор оперных і драм. т-раў у многіх гарадах Германіі. У 1933 эмігрыраваў у Парыж, з 1939 у ЗША. З 1948 у ГДР. Супрацоўнічаў з У.*Дыснеем*, т-рам Б.*Брэхта*, пісаў музыку да яго оперных і драм. спектакляў. У сваіх творах новыя сродкі муз. мовы спалучаў з дакладнай жанравай, структурнай і інтанацыйнай вызначанасцю тэматызму, абумоўленай традыцыямі быт. музыкі. Нац. прэмія ГДР 1953, 1956, 1965, 1974.

Тв.: Оперы (паст. ў Берліне) — «Асуджэнне Лукула» (1951), «Пунціла» (1966), «Ланцэлот» (паводле Я.Шварца, 1969), «Эйнштэйн» (1974), «Леонс і Лена» (1979) і інш.; для хору і салістаў з арк. — араторыі «Хагада» (1936), «Нямецкае Мізэрэрэ» (1947); кантаты; для аркестра — 2 сімфоніі (1926, 1962), Варыяцыі на тэму І.С.Баха (1964), Дывертысмент для камернага арк. (1964), «Аркестравая музыка» № 1—4 (1955—73); «Памяці Брэхта» (1957); камерна-інстр. ансамблі; музыка да спектакляў драм. т-ра і кінафільмаў; песні, хары, фп. п'есы і інш.

Літ.: Хенненберг Ф. Пауль Дессау: Пер. с нем. М., 1979.

ДЭСЕЛЕРО́МЕТР (ад *дэ*... + лац. celero паскараю + ...*метр*), прылада для вымярэння запавольвання руху машын і інш. трансп. сродкаў. Дзеянне заснавана на вызначэнні сіл інерцыі маятніка, па адхіленні якога вызначаюць запавольванне (тармазную сілу). Бываюць маятнікавыя, гідраўлічныя і электронныя, індыкатарныя і самазапісвальныя. Маятнікавыя Д. (з маятнікам, падвешаным на восі ў празрыстым корпусе) прымацоўваюцца прысоскамі да ветра-

А.Дэрэн. Тэмза каля Лонданскага моста. 1900.

вога шкла або пярэдняй панэлі аўтамабіля.

ДЭСЕНСІБІЛІЗА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *сенсібілізацыя*), пазбаўленне ад размернай адчувальнасці (гіперадчувальнасці), зменены рэактыўнасці ў адказ на ўздзеянне «чужога» антыгену (алергена). Дазваляе адысці ад сенсібілізацыі — імуннай рэакцыі, якая пры паўторных сустрэчах з алергенам суправаджаецца пашкоджаннем або праяўленнем хваробы. Павышаная адчувальнасць да антыгену можа быць неадкладнай, ажыццяўляцца праз 1—30 мін з дапамогай спецыфічных антыцел або запаволенай (праз 24—48 і больш гадз) з дапамогай вызначаных клетак імунітэту. Д. значна зніжае рэагаванне ў адказ на ўздзеянне антыгену. Стан Д. набываецца праз мэтанакіраваныя ўздзеянні алергенам на арганізм з павышанай адчувальнасцю. Гіпасенсібілізуючая тэрапія ажыццяўляецца ўрачом алерголагам пры ўвядзенні ў арганізм пацярпелага малых доз алергена, канцэнтрацыю якога з кожным днём павялічваюць, што садзейнічае выпрацоўцы інш. імуннага адказу, з'яўленню «блакіруючых антыцел», якія блакіруюць антыген і не дазваляюць яму выклікаць алергічную рэакцыю. Д. пры алергічных рэакцыях запаволенага (клетачнага) тыпу дасягаецца зняццем прычыны, якая іх правакуе. Дасягнуць Д. ўдаецца рознымі спосабамі, якія забяспечваюць зніжэнне гіперрэактыўнасці ў адказ на ўздзеянне антыгену (алергена). *М.А.Скеп'ян.*

ДЭСЕ́РТ (франц. dessert), садавіна, салодкія стравы (кампот, марожанае і інш.), якія падаюцца ў канцы абеду.

ДЭ СІ́КА (De Sica) Вітторыо (7.7.1902, г. Сора, Італія — 13.11.1974), італьянскі кінаакцёр, рэжысёр. Адзін з заснавальнікаў *неарэалізму*. З 1931 як акцёр здымаўся ў кінакамедыях: «Што за падлюгі гэтыя мужчыны», «Дам мільён», «Пан Макс». Драм. талент выявіўся ў фільме «Генерал Дэла Раверэ». З 1940 выступаў як рэжысёр. Фільмы вылучаюцца высокім майстэрствам, тонкім маст. густам, бездакорнымі акцёрскімі ансамблямі: «Шуша» (1946), «Выкрадальнікі веласіпедаў» (1948, прэмія «Оскар» 1949), «Умберта Д.» і «Цуд у Мілане» (абодва 1951), «Дах» (1956), «Учора, сёння, заўтра» (1963, прэмія «Оскар» 1964), «Шлюб па-італьянску» (1964), «Сланечнікі» (1969, сав.-італьян.), «Сад Фінці-Канціні» (1970, прэмія «Оскар» 1971) і інш. Яго творчасці аднолькава блізкія псіхалагічная глыбіня і высокі драматызм, вострая сатыра і лёгкая, вытанчаная камедыйнасць.

ДЭСІКА́НТЫ, хімічныя рэчывы, якія выклікаюць высушванне раслін. Выкарыстоўваюць у выглядзе водных растворaў і эмульсій для дэсікацыі (перадуборачнае высушванне с.-г. раслін), што паскарае паспяванне насення, пладоў, памяншае іх вільготнасць і аблягчае механізаваную ўборку ўраджаю. У якасці Д. звычайна выкарыстоўваюць: рэглон на насенных пасевах морквы, капусты, буракоў, бульбы; раўндап на насенных пасевах гароху, канюшыны, ільнудаўгунцу; хларат магнію $Mg(ClO_3)_2 \times \times 6H_2O$, хларат-хларыд кальцыю $[Ca(ClO_3)_2$ у сумесі з $CaCl_2]$ на пасевах бавоўніку, пшаніцы, бульбы, цукр. буракоў і інш. *В.П.Дзеева.*

ДЭСІКА́ЦЫЯ (ад лац. desicco высушваю), перадуборачнае падсушванне раслін для паскарэння выспявання і аблягчэння ўборкі ўраджаю. Для Д. выкарыстоўваюць хім. рэчывы — *дэсіканты*, якія разбураюць калоіды пратаплазмы, што рэзка зніжае здольнасць клетак утрымліваць ваду, памяншае колькасць звязанай вады ў расліне і ўзмацняе выпарэнне. Выкарыстоўваюць на пасевах бавоўніку, канапель, сланечніку, рысу, пшаніцы, бульбы, насеннікаў цукр. буракоў і інш.; эфектыўная ў вільготнае надвор'е.

ДЭСКВАМА́ЦЫЯ (ад лац. desquamo выдаляю луску), л у ш ч э н н е, адслойванне горных парод у выглядзе тонкай акругла-выпуклай лускі (1—2 см). Адбываецца на скалістай паверхні пад уплывам рэзкага вагання т-р (у асн. сутачных). Характэрна ў пустынях і высакагорных раёнах, дзе больш інтэнсіўныя працэсы фізічнага выветрывання.

ДЭСКРЫ́ПТАР (позналац. descriptor ад describo апісваю), лексічная адзінка (слова ці словазлучэнне) інфарм.-пошукавай мовы ў ЭВМ. Апісвае асн. сэнсавы змест дакументаў, структуру даных або праграму; служыць таксама для фармулявання інфарм. запыту пры пошуку дакументаў у інфарм.-пошукавай сістэме (гл. *Інфармацыйны пошук*). У якасці Д. можна выбраць любое (звычайна найб. характэрнае) ключавое слова (групу слоў) ці лічбавы код. Многазначным словам адпавядае некалькі Д., сінонімам — адзін Д.

ДЭСКРЫПТЫ́ЎНАЯ ЛІНГВІ́СТЫКА, адзін з трох кірункаў класічнага *структуралізму* (поруч з Пражскім лінгвістычным гуртком і *гласематыкай*), што існаваў у 1-й пал. 20 ст. ў ЗША. Меў на мэце распрацаваць строгія фармальныя працэдуры апісання мовы: сфармуляваць кампактныя, несупярэчлівыя і вычарпальныя правілы, з дапамогай якіх у мове паслядоўна вылучаюцца на розных яе ўзроўнях (фаналагічным, марфалагічным, сінтаксічным) адзінкі, класы адзінак, а таксама вызначаюцца сувязі паміж адзінкамі розных узроўняў мовы і паміж адзінкамі аднаго класа. Для выканання гэтых задач у Дл. распрацаваны 3 прыёмы навук. даследавання мовы: а н а л і з п а н е п а с р э д н а с а с т а ў л я ю ч ы х, т р а н с ф а р м а ц ы й н ы м е т а д і гал. спосаб апісання мовы — д ы с т р ы б у т ы ў н ы м е т а д. Напачатку першыя 2 прыёмы былі скіраваныя на выдзяленне адзінак і на правілы іх камбінавання, а дыстрыбутыўны метад — на выяўленне характару размеркавання адзінак у тэксце; т.ч. браўся пад увагу толькі план выражэння моўных адзінак (іх знешні, фармальны бок) і не разглядаўся іх план зместу (семантычны бок). Зараз выкарыстанне гэтых метадаў абапіраецца і на ўлік семантычных асаблівасцей мовы. Ад Дл. бяруць пачатак некалькі школ: І е л ь с к а я (засн. Л.Блумфілдам), звязаная пераважна з фармалізацыяй апісання мовы; Э н - А р б а р с к а я побач з фармальнымі працэдурамі аналізу ўлічвае і псіхал. фактары ў мове (Ю.Найда, К.Пайк і інш.); г е н е р а т ы ў н а я л і н г в і с т ы к а даследуе звязны тэкст з дапамогай трансфармацыйнага аналізу і матэм. метадаў (Н.Хомскі і інш.).

Літ.: Г л и с о н Г. Введение в дескриптивную лингвистику: Пер. с англ. М., 1959. *Б.А.Плотнікаў.*

ДЭСМАГЕ́Н, тое, што *пракамбій*.

ДЭСМУРГІ́Я (ад грэч. desmos сувязь, павязка + ergon справа), вучэнне аб павязках і метадах іх накладання пры пашкоджаннях і хваробах.

ДЭСО́РБЦЫЯ (ад *дэ...* + *сорбцыя*), выдаленне з вадкасцей ці цвёрдых цел рэчываў, якія яны паглынулі пры *абсорбцыі* і *адсорбцыі*; працэс, адваротны адсорбцыі. Д. робяць награваннем адсарбенту, зніжэннем ціску над ім, апрацоўкай яго растваральнікамі. Выкарыстоўваюць у прам-сці для рэгенерацыі гетэрагенных каталізатараў, атрымання розных рэчываў (пры рэкуперацыі).

ДЭСПАТЫ́ЗМ (ад грэч. despoteia неабмежаваная ўлада), форма неабмежаванай, абсалютнай, самадзяржаўнай улады, для якой уласціва поўнае самавольства, самаўпраўства, грубае і жорсткае падаўленне волі падданых і іх бяспраўе. Д. асабліва характэрны для абсалютных манархій (гл. таксама *Дэспатыя*).

ДЭСПАТЫ́Я, тое, што *дэспатызм*, адна з форм *дыктатуры*. Была пашырана ў стараж.-ўсх. (Асірыя, Вавілонія, Егіпет, Індыя, Іран, Кітай і інш.) і сярэдневяковых краінах — Багдадскім (Абасідаў) халіфаце (8—9 ст.), Візант. імперыі (да 12 ст.), Асманскай імперыі (14—16 ст.), дзяржаве Вялікіх Маголаў у Індыі (16—17 ст.) і інш. У цяперашні час у пераносным сэнсе ўжываецца вытворнае ад Д. слова «дэспат», якім пазначаюць самаўладнага, бязлітаснага чалавека, які не лічыцца ні з чыімі думкамі і жаданнямі.

ДЭСП'Ё (Despiau) Шарль (4.11.1874, г. Мон-дэ-Марсан, Францыя — 28.10.1946), французскі скульптар; майстар партрэта. Вучыўся ў Парыжы ў Школе дэкар. мастацтваў і ў Школе прыгожых мастацтваў (з 1891). У 1907—14 памочнік А.*Радэна*. Творы адметныя паэтычнасцю вобразаў, тонкасцю мадэ-

ліроўкі, якая стварае гульню святлаценяў, яснасцю і цэласнасцю пластычнай формы («Дзяўчынка з Ланд», 1907, партрэт Аньес Меер, 1929, партрэт мадам Фантэн, 1930-я г.). Аўтар «Помніка паўшым» у Мон-дэ-Марсане (1920—22).

Ш.Дэсп'ё. Партрэт мадам Фантэн. 1930-я г.

ДЭСТРУ́КЦЫЯ (ад лац. destructio разбурэнне, парушэнне), 1) парушэнне нармальнай структуры чаго-н., напр., *дэструкцыя ландшафтаў*, *дэструкцыя палімераў*; парушэнне або разбурэнне структуры ўсталяваных эканам., вытв. сувязей у нар. гаспадарцы, установленага парадку і духоўных асноў дзяржавы, іншых утварэнняў, нежыватворчы працэс у розных галінах дзейнасці і пазнання. 2) Высвятленне асноў філас. палажэнняў, адно з цэнтр. паняццяў фундаментальнай анталогіі М.*Хайдэгера*, якое адыграла ў ёй канструктыўную ролю. Пад Д. ён разумеў аналіз («разбор») гіст. асаблівасцей розуму і выяўленне перадумоў чалавечага існавання. Для гэтага, лічыў Хайдэгер, дастаткова ажыццявіць 3 адпаведныя аперацыі: *рэдукцыю*, або вяртанне ад існага да быцця агульных форм узаемадзеяння аб'ектаў; канструкцыю быцця; дэструкцыю традыцыі, якая ўвасабляе аб'ектываванае навук.-тэарэт. разуменне свету, адначасовае выкарыстанне і сціранне традыц. метафізічных паняццяў. З хайдэгераўскай Д. супастаўныя больш позднейшыя і часткова залежныя ад яе канцэпцыі «генеалогіі» ў неаніцшыянстве, «археалогіі ведаў» у М.П.*Фуко*, дэструкцыі ў Ж.*Дэрыда*, «дэзабструкцыі» ў Ф.Везена. *С.Ф.Дубянецкі.*

ДЭСТРУ́КЦЫЯ ў б і я л о г і і, працэс разбурэння мёртвага арган. рэчыва (рэшткаў адмерлых арганізмаў) да больш-менш простых неарган. злучэнняў. Ажыццяўляецца дзякуючы дзейнасці *рэдуцэнтаў* (дэструктараў), у першую чаргу бактэрый і грыбоў, а часткова і як вынік стрававання і экскрэцыі жывёл (*кансументаў*). У найб. буйным маштабе працэсы Д. ў наземных экасістэмах адбываюцца ў глебе (разбураецца да 90% першаснай прадукцыі арган. рэчыва). Прадукты Д. — неарган. рэчывы — потым зноў выкарыстоўваюцца прадуцэнтамі. *В.В.Грычык.*

ДЭСТРУ́КЦЫЯ ЛАНДША́ФТАЎ, парушэнне структуры і стабільнасці ландшафту пад уплывам прыродных або антрапагенных фактараў. Узнікае пры адмоўных зменах балансу ландшафтаўтваральных кампанентаў (напр., у выніку эрозіі і дэградацыі глеб, рэкрэацыйнай дыгрэсіі мясцовасці, нерацыянальнага выкарыстання расліннага покрыва, рэзкіх змен воднага рэжыму і інш.), можа завяршыцца дэградацыяй ландшафтаў. З'явы Д.л. назіраюцца пры парушэнні тэхналогіі меліярацыйнага буд-ва, у месцах інтэнсіўнай распрацоўкі мінер. рэсурсаў, у наваколлі вял. прамысл. прадпрыемстваў. Вакол нас. пунктаў, у зялёных зонах, зонах адпачынку працэсы Д.л. развіваюцца ад празмерных і нерэгуляваных рэкрэацыйных нагрузак. Захаванне прынцыпу рац. прыродакарыстання і аховы прыроды, дакладны разлік параметраў магчымых шкодных уплываў і папярэджанне іх прадухіляюць Д.л.

ДЭСТРУ́КЦЫЯ ПАЛІМЕ́РАЎ, разбурэнне макрамалекул пад уздзеяннем цяпла, кісларoду, святла, іанізуючай радыяцыі, мех. напружання, біял. і інш. знешніх фактараў. Пагаршае ўласцівасці палімераў ці выклікае разбурэнне вырабаў з іх. Для барацьбы з Д.п. распрацаваны метады *стабілізацыі палімераў*.

Д.п. выклікае звычайна адначасовае ўздзеянне некалькіх знешніх фактараў, напр., пры эксплуатацыі на палімерныя вырабы ўздзейнічаюць святло, кісларод і вільгаць паветра, шматразовыя дынамічныя нагрузкі і інш. Пры Д.п. разрываюцца хім. сувязі ў макрамалекулах, што прыводзіць да памяншэння малекулярнай масы і змянення будовы. Часам дэструкцыя суправаджаецца дэполімерызацыяй (рэакцыя, адваротная *полімерызацыі*) — паслядоўным адшчапленнем малекул манамера ад макрарадыкала ці інш. актыўнага палімернага цэнтра. Гэты працэс найб. характэрны для палімераў, якія маюць чацвярцічны атам вугляроду ў ланцугу (напр., поліметылметакрылат). Д.п. адна з прычын *старэння палімераў*. Д.п. выкарыстоўваюць для палягчэння перапрацоўкі (напр., пластыкацыя каўчуку — шматразовая дэфармацыя на вальцах), выкарыстання (напр., для зніжэння вязкасці эфірацэлюлозных лакаў і эмалей праводзяць дэструкцыю цэлюлозы), а таксама высвятлення хім. будовы палімераў.

М.Р.Пракапчук.

Д'ЭСТУРНЕ́ЛЬ ДЭ КАНСТА́Н (d'Estournelles de Constant) Поль (22.11.1852, Шато-дэ-Клермон-Крэан, дэпартамент Сарта, Францыя — 15.5.1924), французскі дзярж. дзеяч. Барон. Юрыст. З 1876 на дыпламат. службе. З 1895 чл. палаты дэпутатаў, з 1904 — сената. Удзельнік 1-й (1899) і 2-й (1907) Гаагскіх мірных канферэнцый, канферэнцыі Міжпарламенцкага саюза (1921),. чл. Міжнар. трацейскага суда ў Гаазе (з 1907). У 1905 заснаваў Асацыяцыю міжнар. прымірэння, пазней узначаліў Аддзяленне Фонду Карнегі ў Еўропе. Аўтар кн. «Французская палітыка ў Тунісе» (1891, прэмія Франц. акадэміі), «Амерыка і яе праблемы» (1913), а таксама кнігі пра Стараж. Грэцыю. Нобелеўская прэмія міру 1909 (разам з А.*Беернарам*).

П.Д'Эстурнель дэ Канстан.

ДЭТАЛЁВАЙ РАЎНАВА́ГІ ПРЫ́НЦЫП, агульнае палажэнне *статыстычнай фізікі*, паводле якога кожны мікраскапічны працэс у раўнаважнай сістэме працякае з той жа скорасцю, што і адваротны яму. Скорасць працэсу ў гэтым выпадку разглядаецца ў статыстычным сэнсе як сярэдняе значэнне скорасці вял. колькасці аднолькавых мікрапрацэсаў. У квантавай тэорыі Д.р.п. выяўляецца ў роўнасці *імавернасцей* прамога і адваротнага працэсаў. Выкарыстоўваецца пры рашэнні задач фіз. і хім. кінетыкі, пры вызначэнні характарыстык квантавых пераходаў і працэсаў сутыкнення атамных і ядз. часціц.

ДЭТА́ЛІ МАШЫ́Н, 1) асобныя састаўныя часткі і іх найпрасцейшыя злучэнні ў машынах, прыладах, апаратах, прыстасаваннях. Робяцца з аднаго матэрыялу без выкарыстання зборачных аперацый.

Да Д.м. адносяцца *валы*, *восі*, спружыны, *падшыпнікі*, *муфты*, *шпіндэлі*, поршні, шасцерні, балты, заклёпкі, шпонкі і інш., а таксама *злучэнні* (раздымныя — балтовыя, шпоначныя, шліцавыя, клінавыя, профільныя; нераздымныя — зварныя, заклёпачныя, прэсавыя), *перадачы* (трэннем — фрыкцыйныя і раменныя; счапленнем — зубчастыя, вінтавыя, чарвячныя, ланцуговыя).

2) Навук. дысцыпліна, якая вывучае тэорыю, разлікі і канструяванне Д.м. Яе задачы: выбар матэрыялаў для вырабу дэталей; наданне дэталям мэтазгодных форм і памераў, якія забяспечваюць трываласць канструкцый; вызначэнне ступені дакладнасці памераў, якасці рабочых паверхняў дэталей; распрацоўка тэхн. умоў на выраб Д.м. і інш. Звязана з *механізмаў і машын тэорыяй*, *супраціўленнем матэрыялаў*, *матэрыялазнаўствам*, *тэхнічнай дыягностыкай*, *надзейнасцю* вырабаў, тэхн. чарчэннем.

Літ.: Детали машин. Расчет и конструирование: Справ. Т. 1—3. 3 изд. М., 1968—69.

ДЭТАНАВА́ННЕ (ад франц. détonner фальшыва спяваць), недакладнае па

вышыні выкананне муз. гукаў, што парушае ладавыя адносіны і ўспрымаецца як фальш. Тэрмін «Д.» выкарыстоўваюць пераважна ў галіне вак. мастацтва, дзе ён абазначае паніжэнне ці павышэнне муз. гуку, а таксама пры ігры на струнных і духавых інструментах.

ДЭТАНА́ТАР (ад франц. détoner узрывацца), зарад *брызантнага выбуховага рэчыва* (БВР), прызначаны ўзбуджаць (ініцыіраваць) *дэтанацыю* ў асн. зарадзе прамысл. (падрыўнога) выбуховага рэчыва або ў боепрыпасах (артыл. снарадах, мінах, бомбах, баявых частках ракет і інш.). Робіцца ў выглядзе метал. або папяровай гільзы, начыненай БВР. Капсуль-Д. — тонкі метал. або пластмасавы каўпачок з БВР, які ствараe пачатковы выбуховы імпульс. Выкарыстоўваецца для ўзбуджэння дэтанацыі ў разрыўных або падрыўных зарадах. Існуюць таксама *электрадэтанатары*, якія ўзбуджаюць дэтанацыю эл. токам.

ДЭТАНА́ЦЫЯ, 1) хуткі працэс хім. ператварэння *выбуховага рэчыва* (ВР), які суправаджаецца выдзяленнем цеплыні і газападобных прадуктаў і распаўсюджваецца са звышгукавой скорасцю (у цвёрдых і вадкіх ВР да 9 км/с).



Да арт. **Дэтанацыя**. Схема дэтанацыйнай хвалі: 1 — размеркаванне ціску ў хвалі; 2 — фронт ударнай хвалі; 3 — прадукты хімічнай рэакцыі; 4 — зона хімічнай рэакцыі; 5 — выбуховае рэчыва.

Пры Д. ўзнікае *ўдарная хваля*, што сціскае і награвае ВР і стварае ўмовы для працякання хім. рэакцый, энергія якіх у сваю чаргу падтрымлівае ўдарную хвалю і забяспечвае пастаянства скорасці яе распаўсюджвання. Пры Д. імгненна ўтвараецца значная колькасць газаў з высокім ціскам (для тратылу 20 ГПа). Д. выклікаецца *дэтанатарам*, эл. разрадам і інш. Пры расшырэнні сціснутых прадуктаў адбываецца *выбух*.

2) Хуткі, блізкі да выбуху працэс гарэння паліўнай сумесі ў поршневых рухавіках унутр. згарання з іскравым запальваннем. Суправаджаецца ўзнікненнем ударных хваль, няўстойлівай работай рухавіка (метал. стук у цыліндры, дымны выкід, перагрэў, знос дэталей і інш.). Узнікае пры неадпаведнасці паліва канструкцыі або рэжыму работы рухавіка. Устойлівасць бензінаў да Д. павышаюць выкарыстаннем *антыдэтанатараў*.

ДЭТА́НДЭР (ад франц. détendre аслабляць), машына для ахаладжэння газаў шляхам іх расшырэння з аддачай знешняй работы. Бываюць поршневыя (падобныя да кампрэсара або паравой машыны) і турбінныя (актыўныя ці рэактыўныя турбадэтандэры). Выкарыстоўваюцца ў прамысл. установах для звадкавання газаў (азоту, кісларoду, гелію і інш. з нізкай т-рай кіпення), раздзялення газавых сумесей метадам глыбокага ахаладжэння, у крыятэнных рэфрыжэратарах, у некаторых сістэмах кандыцыянавання паветра і інш.



Да арт. **Дэтандэр**. Схема цэнтраімклівага рэактыўнага турбадэтандэра: 1 — спіральны падвод газу; 2 — накіравальны саплавы апарат; 3 — ротар; 4 — адвадны дыфузар.

Дэтройт.

ДЭТРО́ЙТ (Detroit), горад у ЗША, на пагранічнай з Канадай р. Дэтройт, паміж азёрамі Гурон і Эры, у штаце Мічыган. 1012,1 тыс. ж., з прыгарадамі 4,67 млн. ж. (1992). Вузел чыгунак і аўтадарог, адзін з гал. партоў у сістэме Вялікіх азёр. Міжнар. аэрапорт. Буйны прамысл. і гандл.-фін. цэнтр ЗША. Найбуйнейшы ў краіне цэнтр аўтамаб. прам-сці (у Д. і яго прыгарадах знаходзяцца праўленні, н.-д. лабараторыі і гал. прадпрыемствы аўтамаб. манаполій «Джэнерал мотарс», «Форд мотар», «Крайслер»; трэць аўтамабіляў краіны збіраецца ў Д. і паблізу горада). З аўтабудаваннем звязаны інш. галіны прам-сці: чорная металургія, металаапр., прыладабуд. інстр., хім., гумаватэхн., шкляная, выт-сць рознага прамысл. абсталявання. Развіты таксама суднабуд., нафтаперапр., харч. прам-сць. Выт-сць аўтабранятанк. тэхнікі. 3 ун-ты.

Засн. ў 1701 французамі як крэпасць і форт. У 1760 захоплены англічанамі, з 1796 у складзе ЗША. З 1802 горад, у 1812 часова захоплены англічанамі. У 1837—47 сталіца штата Мічыган. Інтэнсіўны рост Д. пачаўся пасля 1830 у сувязі з буд-вам Эры-канала (1827), адкрыццём рэгулярнага суднаходства на Вялікіх азёрах. Адзін з цэнтраў *абаліцыянізму*. Значны прыток эмігрантаў з Еўропы. З канца 19 ст. развівалася аўтамаб. прам-сць (у 1903 засн. кампанія «Форд мотар», у 1925 — «Крайслер»). У 1960-я г. адбыліся расавыя хваляванні (у Д. пражывае больш як палова чорнага насельніцтва штата Мічыган), у выніку цэнтр горада быў значна знішчаны.

У горадзе пераважае шахматная планіроўка, ёсць рысы і радыяльна-кальцавога плана (магістраль Гранд-бульвар; радыяльныя вуліцы, якія сыходзяцца ў парку Гранд-сёркус). Асн. пабудовы: Ратуша (1871), Публічная б-ка (1921—23, арх. К.Гілберт), Ін-т мастацтваў (1922—27, арх. П.Крэт, фрэскі Д.Рывера, 1932—33); небаскроб Пенабскат-білдынг (1928), прамысл. комплекс «Крайслер» (1938, арх. А.Кан), канферэнц-зала Уэйнскага ун-та (1957—59) і будынак кампаніі «Рэйналдс металс» (1959, арх. М.Ямасакі), «Рэнесанс-Цэнтр» (1977, арх. Дж.Портман). Музеі: Ін-т мастацтваў (багатыя зборы дэкар.-прыкладнога мастацтва), Грынфілд-вілідж (музей амер. побыту), гісторыі аўтамабіля (у Дырбарне — прыгарадзе Д.).

ДЭТРЫ́Т (ад лац. detritus перацёрты), 1) завісь дробных арганічных рэшткаў у тоўшчы вады ці адклады іх на дне вадаёмаў. Утвараецца з адмерлых раслін і жывёл і іх выдзяленняў. З'яўляецца кормам для водных жывёл — *дэтрытафагаў*. 2) У медыцыне — прадукт распаду тканак. Д. воспенны — саскрэб

воспенных пухіроў са скуры штучна заражанай жывёлы для прыгатавання воспеннай вакцыны.

ДЭТРЫТАФА́ГІ [ад *дэтрыт* + *...фаг*(і)], дэтрытаедныя жывёлы, водныя жывёлы, якія кормяцца *дэтрытам*. У ліку Д. чэрві (паліхеты), эхіўрыды, двухстворкавыя малюскі, калаўроткі, планктонныя ракападобныя і інш. Д. адфільтроўваюць часцінкі дэтрыту з дапамогай спец. органаў або жывяцца імі непасрэдна. Удзельнічаюць у працэсах ачышчэння вады.

ДЭТЭ́КТАР (ад лац. detector адкрывальнік) у радыётэхніцы, прылада для *дэтэктыравання* высокачастотных эл. ваганняў. Адрозніваюць амплітудныя, частотныя і фазавыя Д. Выкарыстоўваюцца ў вяшчальных, сувязных і тэлевізійных радыёпрыёмніках, вымяральных прыладах і інш. для вылучэння мадулюючых частот, якія нясуць інфармацыю.

Амплітудны Д. мае актыўны элемент (лямпавы або паўправадніковы дыёд) і фільтр ніжніх частот. Нізкачастотнае напружанне, што вылучаецца на выхадзе фільтра, адпавядае закону *мадуляцыі*. Амплітуднае дэтэктыраванне магчыма таксама ажыццяўіць лінейным змяненнем (у часе) праводнасці электроннай прылады ў такт з нясучай частатой ваганняў (сінхронны Д.). У частотных і фазавых Д. частотна- і фазамадуляваныя ваганні спачатку пераўтвараюцца ў амплітудна-мадуляваныя, якія потым дэтэктыруюцца амплітудным дэтэктарам. Гл. таксама *Дыскрымінатар*. *А.П.Ткачэнка.*

ДЭТЭ́КТАРНЫ РАДЫЁПРЫЁМНІК, найпрасцейшы *радыёпрыёмнік*, у якім прынятыя сігналы радыёстанцый не ўзмацняюцца, а толькі дэтэктыруюцца (гл. *Дэтэктыраванне*). Прыняты сігнал вылучаецца ў вагальным контуры Д.р., пераўтвараецца *дэтэктарам* у эл. ваганні гукавых частот, якія праслухоўваюцца ў тэлеф. навушніках. У Д.р. адсутнічае ўласная крыніца энергіі і ўсе працэсы ў ім адбываюцца за кошт энергіі прынятых сігналаў. Выкарыстоўваецца для прыёму перадач магутных радыёстанцый, а таксама ў навуч. мэтах.



Схема **дэтэктарнага радыёпрыёмніка**: А — антэна; LC — вагальны контур; D — дыёд; С — блакіровачны кандэнсатар; Т — галаўны тэлефон; З — зазямленне.

ДЭТЭ́КТАРЫ ЯДЗЕРНЫХ ВЫПРАМЯНЕ́ННЯЎ, прылады для рэгістрацыі элементарных часціц, рэнтгенаўскага і гама-выпрамянення і інш. Бываюць электронныя і трэкавыя. Выкарыстоўваюцца ў апаратуры для дэфектаскапіі, мед. дыягностыкі, структурных даследаванняў, спектральнага аналізу, мікраскапіі і інш. Канструктыўнае выкананне Д.я.в. і іх параметры вызначаюцца прызначэннем і асаблівасцямі гэтай апаратуры.

Да арт. **Дэтройт**. «Рэнесанс-Цэнтр». 1977.

Схемы **дэтэктара**: *а* — паралельнага амплітуднага; *б* — балансавага фазавага; $L_КC_К$ — вагальны контур; R, C — нагрузка дэтэктара; D, D_1, D_2 — дыёды; $R_ФC_Ф$ — фільтр ніжніх частот; $U_{увх}$, $U_{вых}$ — уваходнае і выхаднае напружанне; Тр — трансфарматар; Е — крыніца апорных ваганняў.

Прынцып дзеяння Д.я.в. заснаваны на *іанізацыі* або ўзбуджэнні зараджанымі часціцамі атамаў рабочага рэчыва дэтэктара; у выпадку рэгістрацыі нейтральных часціц (напр., гамаквантаў, нейтронаў) іанізацыя і ўзбуджэнне адбываюцца за кошт другасных зараджаных часціц. Электронныя Д.я.в. выпрацоўваюць эл. імпульс, калі ў іх аб'ём трапляе часціца ці квант выпрамянення; эл. сігналы звычайна невялікія і патрабуюць узмацнення (гл. *Ядзерная электроніка*). Да іх адносяць *Гейгераўскі лічыльнік*, *іанізацыйную камеру*, *крышталічны лічыльнік*, *сцынтыляцыйны лічыльнік*, *паўправадніковы дэтэктар* і інш. Трэкавыя Д.я.в. дазваляюць узнавіць траекторыю руху часціцы; да іх адносяць *Вільсана камеру*, *іскравую камеру*, *тэлескоп лічыльнікаў*, ядзерныя фатаграфічныя эмульсіі і інш.

А.В.Берастаў.

ДЭТЭКТЫ́РАВАННЕ, пераўтварэнне электрычных (або інш.) ваганняў, у выніку чаго атрымліваюцца ваганні іншай (як правіла, больш нізкай) частаты. Найб. важны выпадак Д. — працэс, адваротны мадуляцыі (дэмадуляцыя; гл. *Мадуляцыя ваганняў*, *Мадуляцыя святла*) — выдзяленне нізкачастотнага мадулюючага сігналу (напр., ваганняў нізкай частаты ці сігналаў відарысу) з высокачастотных прамадуляваных ваганняў. У залежнасці ад віду мадуляцыі адрозніваюць амплітуднае, частотнае, фазавае і інш. Д.

Для Д. выкарыстоўваецца нелінейнасць вольт-амперных характарыстыкі электронных прылад (вакуумных і паўправадніковых дыёдаў, трыёдаў, транзістараў і інш.). Пры амплітудным Д. ў ланцугу *дэтэктара* амплітудна мадуляваныя ваганні пераўтвараюцца ў высокачастотныя імпульсы адной палярнасці, амплітуда якіх змяняецца паводле закону *мадуляцыі*. Пры частотным (ці фазавым) Д. частотна (фазава) мадуляваныя ваганні спачатку пераўтвараюцца ў амплітудна мадуляваныя, а потым падаюцца на амплітудны дэтэктар. Пры прамым Д. святла на фотакатод прыёмніка падаецца толькі карысны аптычны сігнал; выхадны сігнал прыёмніка мае інфармацыю аб амплітуднай мадуляцыі зыходнай хвалі. Пры гетэрадзінным Д. святла зыходнае выпрамяненне камбінуецца на фотакатодзе з эталонным выпрамяненнем (напр., ад лазера) і выхадны сігнал нясе інфармацыю аб амплітудзе, частаце і фазе зыходнай хвалі.

ДЭТЭКТЫ́ЎНАЯ ЛІТАРАТУ́РА, літаратурныя творы, сюжэты якіх пабудаваны на раскрыцці загадкавай тайны, звязанай са злачынствам. Традыцыйна вызначаецца як адгалінаванне *прыгодніцкай літаратуры*. Зараджэнне Д.л. звязваюць з імёнамі амер. пісьменніка Э.*По* («Забойства на вуліцы Морг», 1841) і англ. У.Колінза («Месячны камень», 1868). По быў пачынальнікам інтэлектуальнага (паказ працэсу расследавання злачынства), Колінз — прыгодніцкага (нанізванне драм. эпізодаў) сюжэтных тыпаў дэтэктываў. Значны ўклад у развіццё Д.л. зрабілі А.К.Грын (ЗША), Э.Габарыо, Г.Леру (Францыя), асабліва А.К.*Дойл* (Вялікабрытанія), які стварыў вядомы вобраз прыватнага дэтэктыва Шэрлака Холмса. З імем англ. пісьменніка Г.К.*Чэстэртана* звязана паяўленне т.зв. «інтуітыўнага дэтэктыва», заснаванага на здагадцы і інтуітыўным пранікненні ў псіхіку злачынцы. Найб. поспеху ў развіцці такога роду дэтэктыва дасягнулі А.*Крысці* і Ж.*Сіменон*. Пасля 2-й сусв. вайны на Захадзе пашырыўся т.зв. «чорны раман», у аснове якога апісанне самога злачынства са сцэнамі забойстваў, насілля і інш. (М.Спілейн, С.Адамс, ЗША). Сярод рус. пісьменнікаў у жанры дэтэктыва працавалі А.Р.Адамаў, Ю.С.Сямёнаў, браты А.А. і Г.А.Вайнеры і інш. У бел. л-ры дэтэктыў у чыстым выглядзе сустракаецца рэдка. Прыкладам гіст. дэтэктыва з'яўляецца раман У.Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». Творы з дэтэктыўным сюжэтам пішуць М.Чаргінец, К.Тарасаў і інш.

В.І.Атрашкевіч, М.Р.Міхайлаў.

ДЭТЭКТЫ́ЎНЫ ФІЛЬМ, твор кіна- і тэлемастацтва, прысвечаны расследаванню крымінальных і інш. злачынстваў, рабоце разведчыкаў. Тэматычна звязаны з *прыгодніцкім фільмам*.

Першыя авантурна-дэтэктыўныя фільмы зняты ў 1910-я г. ў Францыі (серыя фільмаў рэж. Л.Фёяда пра Фантамаса, рэж. В.Жасэ пра сышчыка Ніка Картэра і інш.). Сярод Д.ф. 1930—40-х г. серыялы пра сышчыкаў, фільмы-«паліцэйскія дакументы»; 1960—70-х г. — серыя фільмаў пра супершпіёна Джэймса Бонда. Сярод лепшых Д.ф. сав. кіно: «Подзвіг разведчыка», «Справа № 306», «Мёртвы сезон», «Вяртанне «Святога Лукі», «Чорны прынц», «Пятроўка 38», тэлевізійныя «Семнаццаць імгненняў вясны», «Месца сустрэчы змяніць нельга».

У бел. кіно дэтэктыўную фабулу маюць фільмы «Дзеці партызана», «Напарадзе — круты паварот», «Блакітны карбункул», «Задача з трыма невядомымі», «Дзікае паляванне караля Стаха», тэлевізійныя «Корцік», «Бронзавая птушка», «Апошняе лета дзяцінства» і інш.

ДЭТЭРГЕ́НТЫ (ад лац. detergeo ачышчаю), група паверхневаактыўных рэчываў, што выкарыстоўваюцца пераважна як *мыйныя сродкі*. Маюць дэзенфіцыруючыя ўласцівасці, некат. выкарыстоўваюцца ў фармацэўтычнай, харч. і інш. галінах прам-сці, Д. з зараджанымі (дадэцылсульфат натрыю) або незараджанымі (трытоны) палярнымі канцамі — у біяхіміі пры растварэнні і ачыстцы мембранных бялкоў. Ачышчальны эфект Д. дасягаецца за кошт парушэння іх амфіпатычнымі малекуламі гідрафобных уласцівасцей малекул бялкоў, ліпідаў і інш. рэчываў. Прамысловыя Д., што трапляюць са сцёкавымі водамі ў прыроднае асяроддзе, — небяспечныя забруджвальнікі.

ДЭТЭРМІНА́НТ, вызначнік, алгебраічны выраз, складзены паводле пэўнага правіла з n^2 лікаў, дзе n — парадак дэтэрмінанта. Д. квадратнай *матрыцы* $\begin{vmatrix} a_{11} & a_{12} & \dots & a_{1n} \\ a_{21} & a_{22} & \dots & a_{2n} \\ \dots & \dots & \dots & \dots \\ a_{n1} & a_{n2} & \dots & a_{nn} \end{vmatrix}$ з n^2 элементаў a_{ik} (i — нумар радка, k — нумар калонкі, $1 \le i \le n$, $1 \le k \le n$) наз. алг. сума $\sum \pm a_{1j_1} a_{2j_2} \dots a_{nj_n}$ усіх здабыткаў элементаў гэтай матрыцы, узятых па аднаму з кожнага радка і з кожнай калонкі. Складаемаму $a_{1j_1} a_{2j_2} \dots a_{nj_n}$ прыпісваецца знак «+», калі *перастаноўка* $j_1, j_2, \dots, j_n$ лікаў 1, 2, ..., n мае цотную колькасць *інверсій*, і знак «–», калі колькасць інверсій у ёй няцотная. Напр., Д. 2-га парадку $\begin{vmatrix} a_{11} & a_{12} \\ a_{21} & a_{22} \end{vmatrix} = a_{11} a_{22} - a_{12} a_{21}$.

Лічаць, што: радок (калонка) Д. памнажаецца на лік α, калі кожны элемент гэтага радка (калонкі) памнажаецца на α; складваюцца 2 радкі (калонкі) Д., калі складваюцца адпаведныя элементы гэтых радкоў (калонак), якія стаяць у адной калонцы (радку); да i-га радка (калонкі) Д. дадаецца яго k-ы радок (калонка), калі i-ы радок (калонка) замяняецца сумай i-га і k-га радкоў (калонак); робіцца лінейная камбінацыя радкоў (калонак) Д., калі кожны i-ы радок (калонка) множыцца на адвольны лік α_i і складваюцца атрыманыя радкі (калонкі). Д. мае шэраг уласцівасцей, якія аблягчаюць яго вылічэнне: калі элементы a_{kj} k-га радка Д. d ёсць сумы двух складаемых $a_{kj}=b_j+c_j$, то Д. d роўны суме двух Д. $d=d_1+d_2$, якія адрозніваюцца ад d толькі k-м радком: $b_1, b_2, \dots, b_n$ — k-ы радок Д. d_1, $c_1, c_2, \dots, c_n$ k-ы радок Д. d_2; калі які-н. радок (калонка) Д. памнажаецца на лік α, то і Д. памнажаецца на α; Д. не зменіцца, калі да якога-н. яго радка (калонкі) дадаецца адвольная лінейная камбінацыя інш. радкоў (калонак); для таго, каб Д. быў роўны нулю, неабходна і дастаткова, каб які-н. яго радок (калонка) быў лінейнай камбінацыяй іншых радкоў (калонак). Тэорыя Д. створана ў асноўным у 2-й пал. 18 ст. і 1-й пал. 19 ст. ў працах матэматыкаў: швейц. Г.Крамера, франц. А.Вандэрмонда, П.С.Лапласа, А.Кашы, ням. К.Гаўса і К.Якобі. Франц. матэматык Ж.Дзьеданэ ўвёў паняцце Д. матрыцы над целам (мае важнае значэнне для сучаснай алгебры). Шматлікія дастасаванні Д. да розных пытанняў матэматыкі і фізікі, напр. пры рашэнні лінейных ураўненняў.

Літ.: Курош А.Г. Курс высшей алгебры. 10 изд. М., 1971; Артин Э. Геометрическая алгебра: Пер. с англ. М., 1969; Милованов М.В., Тышкевич Р.И., Феденко А.С. Алгебра и аналитическая геометрия. Ч. 1. Мн., 1984.

Р.І.Тышкевіч.

ДЭТЭРМІНА́ЦЫЯ (ад лац. determinatio абмежаванне, вызначэнне) у эмбрыялогіі ўзнікненне якасных адрозненняў паміж часткамі *зародка* на стадыях развіцця, якія папярэднічаюць з'яўленню ў іх марфалагічна выразных закладак органаў і тканак; адно з асн. паняццяў тэорыі антагенезу. Вылучаюць Д. тканкавую (спецыфічнасць тканак) — абумоўленую філагенетычна ўласцівасць тканкавых структур змяняцца пад уплывам розных уздзеянняў у акрэсленых межах, захоўваючы якасныя адрозненні адна ад адной і Д. полу, якая абумоўлена наяўнасцю Y-храмасомы. Д. прыводзіць да марфалагічна бачнай *дыферэнцыроўкі*. На Д. арганізма, які развіваецца, асн. ўплыў аказваюць генетычныя фактары, з'явы экспрэсіі генаў пад уплывам індукцыйных уздзеянняў, уплыў навакольнага асяроддзя, узаемадзеянне клетак і ўзровень інтэграцыі цэласнага арганізма.

А.С.Леанцюк.

ДЭТЭРМІНІ́ЗМ (ад лац. determino вызначаю), вучэнне аб сувязі і ўзаемаабумоўленасці з'яў рэчаіснасці. Ядром Д. з'яўляецца палажэнне пра існаванне *прычыннасці*, г. зн. такой сувязі з'яў, у якой адна з'ява (прычына) пры пэўных умовах з неабходнасцю нараджае іншую з'яву (вынік). Ідэя Д. ўзнікла ў стараж.-грэч. філасофіі (Геракліт, Дэмакрыт, Эпікур) і найб. ярка выявілася ў ант. *атамістыцы*. Далейшае развіццё і абгрунтаванне Д. набыла ў прыродазнаўстве і матэрыяліст. філасофіі новага часу (Ф.Бэкан, Г.Галілей, Р.Дэкарт, І.Ньютан, М.В.Ламаносаў, К.Лышчынскі, Б.Спіноза, С.Шадурскі і інш.). Механістычны, абстрактны характар Д. гэтага перыяду знайшоў сваё выяўленне ў абгрунтаванні формы прычыннасці законамі механікі, адмаўленні аб'ектыўнага характару выпадковасці, што ў канчатковым выніку вяло да *фаталізму*. У розных кірунках Д. абгрунтоўваецца першапачатковая вызначальнасць усіх з'яў у свеце, уключаючы ўсе працэсы чалавечага жыцця, з боку Бога (тэалагічны Д.), або толькі з'яў прыроды (касмалагічны Д.), або спецыяльна чалавечай волі (антрапалагічны Д.). Прыхільнікі дыялект. матэрыялізму лічылі, што сувязі паміж з'явамі абумоўлены матэрыяльнымі працэсамі. Пра наяўнасць такіх узаемасувязей, на іх думку, сведчаць устанаўленне дакладнага становішча, прычыны і законаў руху цел у механіцы і класічнай фізіцы, устанаўленне верагоднаснай узаемасувязі паміж мікрачасціцамі ў *квантавай механіцы*, паміж асобінамі ў біял. папуляцыях, адкрыццё самарэгулявальных і самакіравальных сістэм у *кібернетыцы* і інш. Паводле гэтай канцэпцыі, гістарычна абумоўленым ва ўсіх сваіх праяўленнях з'яўляецца і грамадства, стан якога ў кожны дадзены момант з'яўляецца вынікам папярэдніх станаў і ўмоў, з якіх вынікае наступнае развіццё. Процілеглась Д. — *індэтэрмінізм*, які адмаўляе ўсеагульны характар прычыннасці або не прызнае яе наогул.

Літ.: Детерминизм: системы, развитие. Мн., 1985; Пригожин И., Стенгерс И. Порядок из хаоса: Пер. с англ. М., 1986; Исторические типы философии. М., 1991; Стереотипы и динамика мышления. Мн., 1993.

С.Ф.Дубянецкі.

ДЭТЭРЫЯРАЦЫ́ЙНЫ КАДА́СТР, сістэматызаваны збор звестак пра пагаршэнне складу і стану навакольнага прыроднага асяроддзя; адзін з відаў *кадастраў*. У Д.к. уваходзяць звесткі пра ўзроўні і крыніцы забруджання вод, глеб і атмасферы, парушаныя землі, іншыя негатыўныя змены, што ўзніклі ў прыродзе (у т.л. пагоршанне навакольнага прыроднага асяроддзя, што адбываецца пад уздзеяннем антрапагенных фактараў — дэтэрыяцыя асяроддзя). Д.к. складаецца па рэгіёнах; матэрыялы, якія змяшчаюцца ў ім, асабліва каштоўныя пры распрацоўцы мерапрыемстваў па рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, аптымізацыі ўмяшання ў навакольнае асяроддзе, вызначэнні кола неабходных прыродаахоўных мерапрыемстваў і шляхоў паляпшэння якасці навакольнага асяроддзя. Складанне Д.к. патрабуе навук. вывучэння прыродных аб'ектаў і з'яў.

ДЭ́ЎЛІНСКАЕ ПЕРАМІ́Р'Е 1618. Заключана 1 снеж. ў в. Дэуліна (цяпер г. Сергіеў Пасад Маскоўскай вобл.) тэрмінам на 14,5 года; спыніла *вайну Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18*. Прадугледжвала перадачу Расіяй (з рас. боку дэлегацыю ўзначальваў баярын Ф.І.Шарамецеў, ВКЛ і Польшчу прадстаўлялі А.Навадворскі, Л.Сапега, Я.Гансеўскі) у склад ВКЛ смаленскіх зямель (акрамя Вязьмы), а ноўгарад-северскіх і чарнігаўскіх зямель з 29 гарадамі Польскаму каралеўству, абмен палоннымі (у ходзе

абмену ў Маскву вярнуўся з палону і бацька цара М.Ф.Раманава патрыярх Філарэт) і інш. Нявырашаным засталося пытанне аб захаванні польск. каралевічам Уладзіславам тытула «цара маскоўскага і ўсяе Расіі». Умовы і вынікі Д.п. ліквідаваны пасля войнаў Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—34 і 1654—67 (гл. *Андросаўскае перамір'е 1667*, *«Вечны мір» 1686*).

ДЭЎРЫЕ́НТ (Devrient) Людвіг (15.12.1784, Берлін — 30.12.1832), нямецкі акцёр. З 1804 гастраляваў з тэатр. трупай па Цюрынгіі, выступаў у прыдворным т-ры ў Дрэсаў, Брэслаўскім т-ры. З 1814 у Берлінскім каралеўскім т-ры. Мастацтва Д. вызначалася ўменнем ствараць жыццёва праўдзівыя і рамантычныя характары, перадаваць адценні пачуццяў і думак сваіх герояў. Сярод лепшых роляў: Лір, Шэйлак, Фальстаф («Кароль Лір», «Венецыянскі купец», «Генрых IV» У.Шэкспіра), Франц Моар, Геслер («Разбойнікі», «Вільгельм Тэль» Ф.Шылера), Гарпагон («Скупы» Мальера). Вобраз Д. стварыў Э.Т.А.Гофман у кнізе «Незвычайныя пакуты аднаго тэатральнага дырэктара» (1819).

ДЭ-ФА́КТА (лац. de facto літар. на справе), у міжнародным праве адна з форм прызнання дзяржавы або ўрада, якая азначае афіцыйнае, але не канчатковае прызнанне. Звычайна прызнанне дэ-факта мае на ўвазе наступленне пэўных прававых вынікаў, але яно мае часовы характар і з'яўляецца пераходным этапам да прызнання *дэ-юрэ*.

ДЭФАЛІ́ЯНТЫ, хімічныя рэчывы, што паскараюць ападанне лісця ў раслін. Д. стымулююць утварэнне этылену — прыроднага рэгулятара росту, які садзейнічае фарміраванню аддзяляльнага слоя ў аснове чаранка, што выклікае ападанне лісця (штучны лістапад). Д. з'яўляюцца некат. *дэсіканты* (хларат магнію, хларат-хларыд кальцыю). Выкарыстоўваюць Д. для перадуборачнага пазбаўлення ад лісця (дэфаліяцыя) на пасевах бавоўніку, бульбы, насеннага лубіну і інш. с.-г. раслін.

ДЭФАЛІ́ЯЦЫЯ (ад *дэ*... + лац. folium ліст), а б я з л і с ц е н н е, перадуборачнае выдаленне лісця з раслін з мэтай паскарэння выспявання і аблягчэння ўборкі ўраджаю. Для Д. выкарыстоўваюць хім. рэчывы — *дэфаліянты*, якія выклікаюць у раслін працэсы, падобныя да прыроднага лістападу: зніжаецца колькасць хларафілу і вады, парушаецца працэс утварэння арган. рэчыва, павялічваецца колькасць прадуктаў распаду бялкоў і інш. злучэнняў, якія перамяшчаюцца з лісцевой пласцінкі ў чаранок, што выклікае адасабленне клетак каля асновы ліста і яго ападанне. Выкарыстоўваюць часцей на пасевах бавоўніку, лубіну, тэхн. сартоў вінограду.

ДЭФАРМА́ЦЫЯ (ад лац. deformatio скажэнне), змена ўзаемнага размяшчэння часцінц (частак) цела, якая вядзе да скажэння яго формы і памераў і ўзнікнення *напружанняў механічных*. Узнікае ад мех. нагрузак, цеплавога расшырэння, уздзеяння эл. і магн. палёў, інерцыйных і гравітацыйных сіл і інш. Найпрасцейшыя віды Д. — *выгін, зрух, кручэнне, расцяжэнне-сціскание*.

У цвёрдых целах адрозніваюць Д. пругкую (узнікае і знікае адначасова з нагрузкай), пластычную (захоўваецца пасля зняцця напружання) і вязка-пругкую (залежыць ад працэсу нагрузкі ў часе, пасля зняцця нагрузкі самаадвольна імкнецца да нуля). Д. бываюць таксама лінейныя (са зменай лінейных памераў цела) і аб'ёмныя (са зменай аб'ёму); агульныя для ўсяго цела (напр., абс. падаўжэнне) і лакальныя (мясцовыя); аднародныя (аднолькавыя ў любым пункце цела) і неаднародныя (змяняюцца ад аднаго пункта цела да другога, уласцівыя рэальным матэрыялам). Д. заўсёды звязана з затратай энергіі, якая пры пругкай Д. пераходзіць у патэнцыяльную, пры пластычнай — у цеплыню. Калі лакальная Д. дасягае гранічнага для дадзенага матэрыялу значэння, адбываецца яго разбурэнне. Пругкія Д. падпарадкоўваюцца законам *пругкасці тэорыі* (для іх выконваецца *Гука закон*), пластычныя — *пластычнасці тэорыі* і *паўзучасці тэорыі*. Пластычная Д. ў крышталічных целах звязана з паяўленем *дыслакацый*. Вымярэнне Д. робяць пры выпрабаванні матэрыялаў, даследаванні збудаванняў у натуры або на мадэлях. Пругкія Д. ўлічваюць пры разліках дэталей машын, інж. канструкцый і збудаванняў; пластычныя — у тэхналогіі металаў (пры пракатцы, штампоўцы, коўцы, валачэнні, прасаванні і інш.), вытв-сці пластмас і керамічных вырабаў. Гл. таксама *Супраціўленне матэрыялаў*.



Дэфармацыі: 1 — расцяжэнне; 2 — сціскання; 3 — зруху; 4 — кручэння; 5 — выгіну.

І.І.Леановіч.

ДЭФЕКА́ЦЫЯ (ад лац. defaecatio ачышчэнне), выдаленне незасвоеных рэшткаў ежы са стрававальнага тракту; у млекакормячых жывёл і чалавека — апаражненне тоўстых кішак ад калавых мас. Пры Д. рэфлекторна расслабляюцца сфінктары, якія закрываюць прамую кішку, і кал выкідваецца перыстальтычнымі рухамі тоўстай і прамой кішак. Цэнтр рэфлексу Д. знаходзіцца ў паяснічнай ч. спіннога мозга. Адвольны ўплыў, што стымулюе ці затрымліве Д., ідзе ад кары галаўнога мозга.

ДЭФЕ́КТ (лац. defectus), недахоп чаго-н., загана. Гл., напр., *Дэфект мас*, *Дэфекты металаў*.

ДЭФЕ́КТ МАС, рознасць паміж сумай мас нуклонаў (нейтронаў і пратонаў), якія ўваходзяць у склад *ядра атамнага*, і масай ядра. Вызначаецца формулай $\Delta = ZM_p + (A-Z)M_n - M_я$, дзе Z — лік пратонаў у ядры, A — масавы лік ядра, M_p, M_n — масы пратона і нейтрона адпаведна, $M_я$ — маса ядра атама. Д.м. выражаецца ў *атамных адзінках масы* і роўны (з адваротным знакам) *энергіі сувязі* нуклонаў у ядры. Чым большы Д.м., тым вышэйшая энергія сувязі і тым больш устойлівае ядро. Гл. таксама *Ядзерная энергія*.

ДЭФЕКТАЛО́ГІЯ (ад *дэфект* + *...логія*), навука пра заканамернасці псіхічнага развіцця, выхавання і навучання дзяцей, якія патрабуюць асаблівай увагі: глухіх, сляпых, са слабым зрокам ці слыхам, разумова адсталых, з затрымкай псіхічнага развіцця, цяжкімі парушэннямі маўлення, вынікамі дзіцячага цэрэбральнага паралічу, комплекснымі парушэннямі (слепаглухіх, глухіх з разумовай адсталасцю, сляпых з затрымкай псіхічнага развіцця і інш. камбінацыямі). Як самаст. галіна навукі склалася ў пач. 19 ст. Сучасная Д. апіраецца на дасягненні псіхалогіі, педагогікі, у т.л. народнай, прыродазнаўства, медыцыны, тэхнікі, радыёэлектронікі. Вызначае структуру і сістэму метадаў і методык дыягностыкі і дыферэнцыяльнай дыягностыкі стану своеасаблівага псіхічнага развіцця дзяцей з парушэннямі ў сістэме аналізатараў, ц.н.с., маўленчай дзейнасці; распрацоўвае прынцыпы, абгрунтоўвае змест, метады і сродкі карэкцыйна накіраванага навучання і выхавання; даследуе праблемы абілітацыі (стварэнне механізмаў кампенсацыі ў дзяцей з прыроджаным дэфектам), рэабілітацыі (сістэма мер па рэадаптацыі асоб з набытым дэфектам), сац. адаптацыі, прафарыентацыі. У Беларусі праблемы Д. распрацоўваюцца на кафедрах дэфекталагічнага ф-та Бел. пед. ун-та, у сектарах аддзялення Д. Нац. ін-та адукацыі, на кафедры Д. Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Спецыялістаў для спец. дзіцячых устаноў рыхтуе Бел. пед. ун-т і педвучылішча № 2 у Мінску.

Т.А.Грыгор'ева.

ДЭФЕКТАСКАПІ́Я (ад *дэфект* + *...скапія*), комплекс фізічных метадаў і сродкаў *неразбуральнага кантролю* якасці матэрыялаў і вырабаў (парушэння суцэльнасці, адхілення ад зададзеных фіз.-мех. уласцівасцей, хім. саставу, структуры, геам. памераў і інш.).

Да метадаў Д. адносяцца: аптычныя (візуальныя), акустычныя (ультрагукавыя), магнітныя, радыяцыйныя (у т.л. гама-метады і рэнтгенаўскія), радыёхвалевыя, цеплавыя (інфрачырвоныя), віхратокавыя (электраіндуктыўныя), электрычныя (у т.л. тэрма- і трыбаэлектрычныя, электрастатычныя), капілярныя (люмінесцэнтныя, каляровыя) і інш. Большасць метадаў Д. заснавана на ўзаемадзеянні акустычных або электрамагнітных ваганняў, фіз. палёў (магнітных, электрамагнітных, радыёхвалевых і інш.) з выпрабавальнымі вырабамі на лакальных іх участках або па ўсім аб'ёме. Д. рашае задачы з выкарыстаннем гэтых метадаў па выяўленні ў вырабах розных тыпаў паверхневых і ўнутраных дэфектаў — трэшчын, валасавін, ракавін, шлакавых уключэнняў, адслаенняў і інш.

На Беларусі навук. работы па Д. вядуцца з 1964 у Ін-це прыкладной фізікі Нац. АН. Развіваецца капілярны метад (у прыватнасці, для кантролю керамічных, кампазітных і інш. вырабаў), ультрагукавы метад з выкарыстаннем магн. вадкасці; распрацоўваюцца асновы магн., эл.-магн. і радыёхвалевага метадаў; створаны прылады магн., магнітаграфічнага, віхратокавага і радыёхвалевага кантролю.

Літ.: Ермолов И.Н. Теория и практика ультразвукового контроля. М., 1981; Прохоренко П.П., Мигун Н.П. Введение в теорию капиллярного контроля. Мн., 1988; Зацепин Н.Н., Коржова Л.В. Магнитная дефектоскопия. Мн., 1981.

М.М.Зацэпін.



Да арт. **Дэфектаскапія**. Схема рэнтгенаўскага прасвечвання: 1 — крыніца рэнтгенаўскага выпрамянення; 2 — пучок рэнтгенаўскіх прамянёў; 3 — дэталь; 4 — дэфект; 5 — рэгістратар рэнтгенаўскага відарыса.

ДЭФЕКТАСКО́П (ад *дэфект* + *...скоп*), прылада або ўстаноўка для выяўлення дэфектаў (тыпу парушэнняў суцэльнасці ці аднароднасці, адхіленняў у хім. саставе) у матэрыялах, паўфабрыкатах і вырабах метадамі *неразбуральнага кантролю*. Стацыянарныя і лабараторныя Д. абсталёўваюць асцылаграфічнымі і лічбавымі індыкатарамі, самапіснымі прыстасаваннямі; пераносныя — стрэлачнымі прыладамі, гукавымі або асвятляльнымі сігналізатарамі. Існуюць Д., якія кантралююць рухомыя вырабы або самі рухаюцца адносна вырабаў (рэйкавыя Д., Д.-цялежкі і інш.).



Схема аптычнага **дэфектаскопа**: 1 — аб'ект даследавання (паўправадніковая пласціна); 2 — пучок светлавых прамянёў; 3 — крыніца выпрамянення; 4 — экран.

Адрозніваюць Д.: ультрагукавыя (выкарыстоўваюць уласцівасць ультрагукавых хваль адбівацца ад дэфектаў, напр., трэшчын); рэнтгенаўскія і гама-Д. (прасвечваюць вырабы і матэрыялы адпаведнымі прамянямі, фіксуюць трэшчыны, ракавіны, пабочныя ўключэнні); магнітныя (з дапамогай магн. поля збіраюць магн. парашок або суспензію ў месцах дэфектаў); электраіндуктыўныя (узбуджаюць у вырабе або матэрыяле віхравыя токі, сіла і шчыльнасць якіх залежаць ад наяўнасці дэфектаў); люмінесцэнтныя (выяўляюць парушэнні пакрыццяў на дэталях электронных прылад); аптычныя (устаноўкі з прасветным экранам для візуальнага кантролю або сістэмай аўтам. аналізу відарысу; выяўляюць мікрашчыліны, мех. напружанні, адшчэпы, драпіны, скопішчы дыслакацый па змене інтэнсіўнасці адбітых прамянёў) і інш. Гл. таксама *Дэфектаскапія*.

П.П.Прахарэнка.

ДЭФЕ́КТЫ МЕТА́ЛАЎ, недасканаласці (парушэнні) будовы металаў і сплаваў (пераважна рэгулярнай крышт. структуры), якія пагаршаюць іх фіз.-мех. ўласцівасці. Дэфектамі лічацца адхіленні ад нармальнай (прадугледжанай тэхн. ўмовамі, стандартамі) якасці металу па хім. саставе, структуры, суцэльнасці, стане паверхні, якія вядуць да зніжэння сортнасці або забракоўкі вырабаў. Выяўляюць Д.м. метадамі *дэфектаскапіі*, *металаграфіі*, *рэнтгенаструктурным аналізам* і інш., ліквідуюць найчасцей *тэрмічнай апрацоўкай*.

Адрозніваюць Д.м.: тонкай структуры (*вакансіі*, *дыслакацыі* і інш., гл. *Дэфекты ў крышталях*); мікрадэфекты (дэндрыты, мікрапоры, мікратрэшчыны, мікрапузыры газаў, плёны, неправары і інш., выяўляюцца аптычнымі мікраскопамі); макрадэфекты (валасавіны, трэшчыны, поры, газавыя пузыры, умяціны, драпіны, ірваніны і інш.). Д.м. узнікаюць з-за недасканаласці або парушэнняў тэхнал. працэсаў пры плаўленні металаў і атрыманні адлівак (неметал. ўключэнні, шлакавіны, усадачная і газавая порыстасць, ракавіны і г.д.), пры апрацоўцы ціскам (расслаенні, заковы, валасавіны, флокены і г.д.), пры тэрмічнай, хімікатэрмічнай, электрахім. і мех. апрацоўцы (трэшчыны, прыпяканні, *абезвуглярожванні* і г.д.), пры зварцы, паянні, кляпанні (неправары, непрапаі, карозія і г.д.). Дэфекты ў паўфабрыкатах і гатовых вырабах могуць узнікаць таксама пры транспарціроўцы, захоўванні і эксплуатацыі (напр., *карозія металаў*). Высокая якасць металаў і вырабаў з іх забяспечваецца ўдасканаленнем тэхналогіі вытв-сці і метадаў кантролю іх якасці.

ДЭФЕ́КТЫ Ў КРЫШТА́ЛЯХ, парушэнні перыядычнасці размяшчэння часціц у *крышталічнай рашотцы*. Узнікаюць пры росце крышталёў ці іх фазавых ператварэннях, цеплавых, мех., эл. і інш. уздзеяннях, увядзенні дамешкаў. Адрозніваюць дэфекты кропкавыя (нульмерныя), лінейныя (аднамерныя), паверхневыя (двухмерныя) і аб'ёмныя (трохмерныя).

Кропкавыя дэфекты — парушэнні перыядычнасці ўласнай атамнай структуры крышталя: *вакансіі*; атамы і іоны, што перамясціліся з нармальнага становішча ў міжвузелле (міжвузельныя атамы і іоны); атамы і іоны ў крышталях хім. злучэнняў, якія займаюць вузлы «чужой» падрашоткі; дэфекты, што ўзнікаюць пры ўвядзенні ў крышталь дамешкавых атамаў. Узаемадзеянне такіх дэфектаў паміж сабой прыводзіць да ўзнікнення складаных дэфектаў: дывакансій (падвойных вакансій), кластараў (скопішчаў дэфектаў) і інш. Лінейныя дэфекты — ланцужкі кропкавых дэфектаў, краявыя і вінтавыя *дыслакацыі*. Паверхневыя дэфекты: няправільна ўкладзеныя слаі атамаў (дэфекты ўпакоўкі); заканамерныя парушэнні нармальнага чаргавання атамных плоскасцей; дэфекты *двайнікавання* з кропкавай сіметрыяй; межы ўключэнняў; сама паверхня крышталя і інш. Аб'ёмныя дэфекты: парушэнні, звязаныя з адхіленнем ад законаў стэхіяметрыі; скопішчы вакансій; нерэгулярныя ўтварэнні ў выглядзе расколін, пустот, уключэнняў іншай фазы; скопішчы дамешкаў на дыслакацыях, у зонах росту і інш. макраскапічныя дэфекты. Д. ў к. уплываюць на мех., аптычныя, эл., магн. і інш. ўласцівасці крышталёў. У дасканалай крышт. рашотцы рух атамаў і іонаў немагчымы; у крышталях з дэфектамі міграцыя атамаў абумоўлівае ўзаемную дыфузію цвёрдых цел, хім. *цвердафазныя рэакцыі* і інш. з'вы. Д. ў к. могуць уводзіцца мэтанакіравана або ўзнікаць выпадкова пад уздзеяннем фактараў, якія не кантралююцца. Спец. ўвядзенне дэфектаў або іх выдаленне — важная частка тэхналогіі вытв-сці *паўправадніковых матэрыялаў*, *люмінафораў*, лазерных і фотахромных крышталёў і шкла, *паўправадніковых прылад*. Шчыльнасць непажаданых дэфектаў памяншаецца ўдасканаленнем метадаў вырошчвання і апрацоўкі крышталёў. Д. ў к. вывучаюцца аптычнымі метадамі, іоннай і электроннай мікраскапіяй, метадам выбіральнага траўлення, рэнтгенадыфракцыйнымі і ядз.-фіз. метадамі.

Літ.: Современная кристаллография. Т. 2. М., 1979; Вавилов В.С., Кив А.Е., Ниязова О.Р. Механизмы образования и миграции дефектов в полупроводниках. М., 1981; Орлов А.Н. Введение в теорию дефектов в кристаллах. М., 1983; Орлов А.Н., Трушин Ю.В. Энергии точечных дефектов в металлах. М., 1983.

Р.М.Шахлевіч.

ДЭФІБРА́ТАР (ад *дэ...* + лац. fibra валакно), апарат для прыгатавання драўнянай масы пры вытв-сці драўнянастружкавых пліт, паперы і інш. Рабочыя органы — нерухомы і рухомы метал. дыскі, паміж якімі сціраецца папярэдне прапараная здробненая драўніна, атрыманая на рубільных машынах з балансаў або адходаў лесапілавання.

ДЭФІБРЭ́Р, машына для атрымання драўнянай масы сціраннем балансавай драўніны на вярчальным абразіўным камені. У магутных Д. камяні дыяметрам 1500—1800 мм, шырынёй каля 1400 мм, у асн. штучныя — з кварцавага, карундавага або карбарундавага зерня на цэментнай, керамічнай ці інш. звязцы. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці паперы, кардону і інш.

ДЭ ФІЛІ́ПА (De Filippo; сапр. Пасарэлі; Passarelli) Эдуарда (24.5.1900, г. Неапаль, Італія — 1.11.1984), італьянскі драматург, акцёр, рэжысёр т-ра і кіно. З сям'і акцёраў, дэбютаваў на сцэне ў 11 гадоў. У 1931—73 кіраўнік і акцёр створанай ім у Неапалі трупы «Камічны т-р Дэ Філіпа». Аўтар п'ес «Філумена Мартурана» (1946; у 1964 паводле яе В.*Дэ Сіка* зняў фільм «Шлюб па-італьян-

ску»), «Мана на доўгіх нагах» (1948), «Мая сям'я» (1955), «Субота, нядзеля, панядзелак» (1960), «Мэр раёна Саніта» (1961) і інш. У кіно з 1932 выступаў як акцёр (у камедыях, пастаўленых па сваіх сцэнарыях), з 1939 — як рэжысёр. Экранізаваў свае п'есы. Сярод акцёрскіх работ — ролі ў фільмах «Травіята 1953 года», «Дзяўчаты з плошчы Іспаніі», «Золата Неапаля». Лепшы яго фільм «Неапаль — мільянер» (у пракаце «Неапаль — горад мільянераў»). У творчасці спалучаў традыцыі неапалітанскага дыялектальнага т-ра, які ўзыходзіць да *камедыі дэль артэ*, з прынцыпамі *неарэалізму*.

ДЭФІЦЫ́Т (ад лац. deficit не хапае), 1) недахоп чаго-н., няхватка ў чым-н. (напр., Д. матэрыялаў). 2) Страта, перавышэнне расходаў над даходамі (напр., Д. плацежнага балансу).



Чатырохпрэсавы дэфібрэр: 1 — насечны апарат; 2 — башмак; 3 — гідрацыліндр прэсавай каробкі; 4 — поршань са штокам; 5 — манометр; 6 — абразіўны камень.

ДЭФЛАРА́НТЫ, хімічныя рэчывы, якія выкарыстоўваюць для знішчэння кветак раслін з мэтаю папярэджання іх плодананашэння. Апрацоўку Д. праводзяць у гасп. мэтах або для абмежавання і прадухілення пашырэння непажаданых відаў раслін.

ДЭФЛАРА́ЦЫЯ [ад *дэ*... + лац. flos (floris) кветка, маладосць, дзявоцкасць], парушэнне цэласнасці дзявоцкай плявы. Звычайна бывае пры першых палавых зносінах. Суправаджаецца нязначным крывацёкам, хоць нярэдкія выпадкі, калі яго няма. Прыблізна праз 3—5 дзён пасля Д. краі парушанай дзявоцкай плявы загойваюцца і палавая блізкасць не выклікае болевых адчуванняў. Іншы раз, у залежнасці ад анат. будовы, дзявоцкая плява расцягваецца і застаецца непашкоджанай пасля неаднаразовых палавых актаў.

ДЭФЛЕ́КТАР (ад лац. deflecto адхіляю, адводжу), 1) прыстасаванне для змены напрамку патоку газаў, вадкасцей, сыпкіх матэрыялаў, гукавых хваль. 2) Выцяжное прыстасаванне на вентыляцыйнай шахце (для адсмоктвання забруджанага паветра з памяшканняў) або коміне. Дзеянне заснавана на выкарыстанні энергіі патоку паветра (ветру), які абдзімае Д. 3) Прылада для вымярэння і ўстаранення *дэвіяцыі* магнітных компасаў. Вымярае гарыз. і верт. складальныя напружанасці магнітнага поля, якія дзейнічаюць на стрэлку компаса. 4) У оптаэлектроніцы прыстасаванне для змены паводле пэўнага закону напрамку распаўсюджвання аптычнага выпрамянення. Бываюць механічныя (сканеры) і оптаэлектронныя (у т.л. вадкакрышталічныя). Найб. пашыраны электрааптычныя і акустааптычныя. Выкарыстоўваюцца ў сістэмах аптычнай апрацоўкі інфармацыі, у аптычных запамінальных прыстасаваннях, у лазерных друкавальных прыстасаваннях і інш.

ДЭФЛЯ́ЦЫЯ (ад позналац. deflatio выдзіманне) у эканоміцы, працэс стрымлівання росту грашовай масы шляхам зняцця часткі залішніх, у параўнанні з патрэбнасцямі грашовага абарачэння, папяровых грошай. Праводзіцца ў мэтах барацьбы з *інфляцыяй* шляхам павышэння падаткаў, скарачэння бюджэтных выдаткаў, стымулявання скарачэння крэдытаў, росту зберажэнняў і да т.п.

ДЭФЛЯ́ЦЫЯ, развяванне, разбурэнне горных парод і глеб пад уздзеяннем ветру з наступным пераносам цвёрдых часцінак (часам на вял. адлегласці) і іх абточваннем. Асабліва моцна праяўляецца ў пустынях. У Беларусі бывае на асушаных тарфяна-балотных і мінер. глебах Палесся, часам у форме пылавых бур.

ДЭФО́ (Defoe) Даніэль (1660?, Лондан — 24.4.1731), англійскі пісьменнік, публіцыст; адзін з заснавальнікаў еўрап. рэаліст. рамана. Скончыў дысентэрскую (пурытанскую) акадэмію. Пісаў паліт. памфлеты, вершаваныя сатыры («Чыстакроўны англічанін», 1701; «Найкарацейшы шлях расправы з дысентэрамі», 1702), за якія быў прыгавораны да турэмнага зняволення. Аўтар докумэнт. прозы («Запіскі кавалера», 1720; «Дзённік чумнага горада», 1722), авантурна-прыгодніцкіх раманаў («Капітан Сінгльтан», 1720, «Гісторыя палкоўніка Жака» і «Моль Флендэрс», абодва 1722). Сусв. вядомасць яму прынёс раман «Жыццё і дзіўныя прыгоды марахода Рабінзона Круза» (ч. 1—2, 1719). Тэма «рабінзанады» як спроба стварэння



Д.Дэфо.

асноў матэрыяльнай і духоўнай культуры ў адрыве ад цывілізацыі стала вельмі папулярная і выклікала ў далейшым шмат наследаванняў (у бел. л-ры «Палескія рабінзоны» Я.Маўра). На бел. мову раман пераклала А.Васілевіч (1976).

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1971.

Г.Я.Адамовіч.

ДЭ ФРЫЗ, Дэ Фрыс (De Vries) Гуга (16.2.1848, г. Харлем, Нідэрланды — 21.5.1935), галандскі батанік; адзін з заснавальнікаў вучэння пра зменлівасць і эвалюцыю. Замежны ганаровы чл. АН СССР (1932). Скончыў ун-т у г. Лейдэн (1870). У 1878—1918 праф. Амстэрдамскага ун-та і дырэктар бат. сада. Навук. працы па распрацоўцы мутацыйнай тэорыі. Прапанаваў тэрмін «мутацыя», ажыццявіў эксперым. вывучэнне эвалюцыйнага працэсу. Распрацаваў метад вызначэння асматычнага ціску ў раслін і вучэнне пра ізатанічныя каэфіцыенты (1877). Паўторна, незалежна ад ням. батаніка К.Э.Корэнса і аўстр. генетыка Э.Чэрмак-Зайзанега адкрыў законы Мендэля (1990).

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. М., 1932.

ДЭХКА́Н, дыхкан (перс.), у раннім сярэдневякоўі ў Іране і Сярэдняй Азіі абшчынныя вярхі, сярэднія і буйныя землеўладальнікі. Тэрмін вядомы з часоў *Сасанідаў*. Пасля 13 ст. яго ўжывалі пераважна ў значэнні «селянін, земляроб».

ДЭЦЫ... (ад лац. decem дзесяць), дзесятковая прыстаўка для ўтварэння найменняў *дольных адзінак*, роўных 1/10 ад зыходных адзінак. Абазначаецца д. Напр., 1 дБ (дэцыбел) = 0,1 Б, 1 дм (дэцыметр) = 0,1 м.



Дэфлектары: *а* — механічны круглай формы (1 — патрубак, 2 — дыфузар, 3 — парасонкаўпак); *б* — электрааптычны дыскрэтны (1 — мадулятары святла, 2 — двухпраменепраламляльныя крышталі).

ДЭ́ЦЫМА, гл. ў арт. *Інтэрвал.*

ДЭЦЫМА́ЦЫЯ (лац. decimatio), пакаранне, упершыню прадугледжанае старажытным рымскім ваенным заканадаўствам за ўдзел у калектыўных злачынствах. Паводле правіл Д. каралі (звычайна пакараннем смерцю) кожнага дзесятага. Пазней прыклад рымлян перанялі Швецыя пры Густаве Адольфу, Францыя пры Напалеоне I, Аўстра-Венгрыя пры Францу Іосіфу. У Расіі Д. ўпершыню выкарыстаў Пётр I за пакіданне войскам поля бою, назіралася яна і пры імператарах Аляксандру I і Мікалаю I. У гады 2-й сусв. вайны Д. ўжывалі нямецкія фашысты ў адносінах да ваеннапалонных і мірных жыхароў акупіраваных тэрыторый. Прычына ўзнікнення Д. — прынцып усеагульнага запалохвання, якога прытрымліваліся карныя палітыка адпаведных дзяржаў.

ДЭЦЭБА́Л (Decebalus; ?—106), цар *дакаў* [87—106]. Пасля перамогі над рымлянамі ў вайне пры імператару *Даміцыяне* ў 89 Д. заключыў мір, паводле якога Рым павінен быў штогод выплачваць дакам субсідыі. Умацаваў дзяржаву, устанавіў прагрэс. формы ўнутр. кіравання. У выніку войнаў з рым. імператарам *Траянам* (101—102 і 105—106) тэр. дакаў была заваявана і ўтворана рым. прав. *Дакія*. Пасля падзення сталіцы дакаў Д. уцёк у горы, нейкі час вёў партыз. вайну супраць рымлян. Перакананўшыся ў беспаспяховасці барацьбы, скончыў самагубствам.

ДЭЦЭНТРАЛІЗА́ЦЫЯ (ад *дэ...* + *цэнтралізацыя*), перадача функцый кіравання ад цэнтр. органаў улады мясц. органам, пашырэнне кола паўнамоцтваў ніжэйшых органаў кіравання за кошт вышэйшых; ліквідацыя або паслабленне *цэнтралізацыі*.

ДЭ́ШНЕР (Deszner) Саламея (1759, г. Беласток, Польшча — 20.3.1809), польская актрыса драмы і оперы, рэжысёр і антрэпрэнёр. Выканаўца роляў маладых гераінь і субрэтак. У 1777—85 і 1790—94 у Варшаўскім т-ры. У 1785—90 працавала ў т-рах Львова, Вільні. З 1794 у Гродне, дзе ў 1802 стварыла першы пастаянны т-р, якім кіравала да канца жыцця (гл. *Гродзенскі тэатр С.Дэшнер*).

ДЭ́ШПАТЫ-ЗЯНО́ВІЧЫ, шляхецкі род у ВКЛ; гл. *Зяновічы*.

ДЭШТ (перс. пустыня), назва пустынных раўнін на Іранскім нагор'і, у Сярэдняй Азіі і Зах. Кітаі. Пераважаюць бязводныя, друзаватыя і галечнікавыя паверхні, саланчакі. Тэрмін «Д.» увахо-дзіць у састаў уласных назваў пустынь Дэштэ-Кевір, Дэштэ-Лут, Дашты-Марго і інш.

ДЭШТ-І-КІПЧА́К, Кіпчакскі стэп, назва ў арабскіх і перс. крыніцах 11—15 ст. тэр. ад р. Іртыш да р. Дунай, ад Крыма да г. Балгар Вялікі (гл. *Балгарыя Волжска-Камская*), дзе качавалі кіпчакі (*полаўцы*). У 13 ст. заваяваны манголамі. Падзяляўся мяжой па Урале і р. Яік (цяпер Урал) на Усх. і Заходні Кіпчак (вядомы ў рус. летапісах пад назвай *Палавецкая зямля*). У 16—18 ст. Д.-і-К. называлася толькі ўсх. частка (тэр. сучаснага Казахстана).

ДЭ́ШТЭ-КЕВІ́Р, пустыня на Пн Іранскага нагор'я, у Іране. Даўж. каля 500 км, шыр. да 250 км. Пл. каля 55 тыс. км^2. Шэраг падзеленых вузкімі нізкімі градамі бяссцёкавых пласкадонных упадзін, дно якіх знаходзіцца на выш. 600—800 м. Упадзіны заняты саланчакамі, такырамі, перасыхаючымі салёнымі балотамі. У час дажджу ўтвараюцца азёры непраходнай гразі. Летам паверхня саланчакоў пакрыта саляной скарынкай, пад якой ляжыць пясчана-глеевая багністая маса. На паўн. ускраіне Д.-К. вял. аазісы. На вял. прасторах расліннасць адсутнічае. Абвадняецца перасыхаючымі вадатокамі, якія сцякаюць у асн. з паўд. схілаў Эльбурса. Нац. парк Кевір, на У пустыні — частка рэзервата Туран.

ДЭ́ШТЭ-ЛУТ, пустыня ў цэнтры Іранскага нагор'я, на У Ірана. Даўж. каля 550 км, шыр. да 200 км. Пл. 80 тыс. км^2. Пераважныя выш. 500—600 м. Шэраг пласкадонных бяссцёкавых упадзін (дно на выш. 200—250 м) і горных перамычак выш. 1000—2000 м (да 2992 м). Паверхня ў асн. гліністая і друзаватая. Трапляюцца саланчакі, такыры. На Пд і У барханныя і градава-ўзгорыстыя пяскі, якія слаба замацаваны саксаулам, джузгунам і салянкамі. Фіз. выветрыванне ўтварыла шматлікія «стаўбы», «грыбы» і інш. формы рэльефу. На ўскраінах зрэдку аазісы з фінікавымі пальмамі.

ДЭШТЭСТА́Н, паласа прыбярэжных пустынных раўнін у Іране і Пакістане, тое, што *Гермсір*.

ДЭШЫФРАВА́ННЕ аэрафотаздымкаў, метад даследавання мясцовасцей і атм. з'яў па іх касмічных і аэрафотаадлюстраваннях. Заключаецца ў выяўленні, распазнаванні аб'ектаў, вызначэнні іх якаснай і колькаснай характарыстык па дэшыфравальных прыкметах (прамых і ўскосных) і паказе іх умоўнымі знакамі на картах, схемах. Адрозніваюць комплекснае (агульнагеагр., ландшафтнае і інш.) і галіновае Д., якое выкарыстоўваецца ў ваен. справе, тапаграфіі, картаграфіі, геалогіі, пры пошуках карысных выкапняў, землеўпарадкаванні, акіянаграфіі (прыбярэжныя часткі дна мораў), метэаралогіі і інш. Праводзіцца ў 3 этапы: папярэдняе (зняцце першаснай інфармацыі са здымкаў і нанясенне яе на папярэднія схемы); палявое (праверка першаснай інфармацыі на мясцовасці, выяўленне індыкатараў аб'екта, які даследуецца) і канчатковае — камеральнае (складанне канчатковых карт па ўдакладненых даных). Гл. таксама *Аэрафотаздымка* і *Аэракасмічныя метады*.

ДЭШЫФРА́ТАР (ад франц. déchiffrer разбіраць, разгадваць), прылада для аўтам. расшыфроўкі кода (дэкадзіравання) паведамленняў. Пераўтварае даныя ў зыходную форму, якую яны мелі да кадзіравання (шыфравання).

Інфармацыя, што паступае на ўваходы Д., пераўтвараецца і на адпаведным выхадзе (ці групе выхадаў) вылучаецца сігнал, які паказвае прыкмету (або змест) уваходнага сігнала, напр. код прынятага ліку пераўтварае ў сігнал кіравання пэўным каналам сувязі (калі лік мае n двайковых разрадаў, Д. можа мець да 2^n выхадаў), код аперацыі — у кіроўны сігнал, код адраса — у сігнал выбаркі адпаведнай ячэйкі памяці запамінальнага прыстасавання ЭВМ і інш. Бываюць патэнцыяльныя, імпульсныя і патэнцыяльна-імпульсныя; паводле прынцыпу дзеяння адрозніваюць паралельныя, паслядоўныя і паралельна-паслядоўныя, паводле будовы — лінейныя, пірамідальныя і прамавугольныя. Выкарыстоўваюцца ў радыё-, выліч. і вымяральнай тэхніцы, тэлеф. і тэлегр. сувязі, тэлекіраванні і інш. Гл. таксама *Дэкодэр, Дэтэктар*.

М.П.Савік.

ДЭШЭЛЕ́Т (Déchelette) Жазеф (8.1.1862, г. Руан, Францыя — 4.10.1914), французскі археолаг. Вывучаў сярэдневяковы жывапіс, гала-рымскую рэльефную чырваналакавую кераміку. У 1897—1901 кіраваў раскопкамі гарадзішча Мон-Бёўрэ (гл. *Бібракта*). Аўтар шматтомнай працы «Кіраўніцтва па археалогіі першабытнай, кельцкай і гала-рымскай» (т. 1—6, 1908—34), складзенай у асн. на франц. матэрыяле, якая дае класіфікацыю і храналогію шырокага кола археал. помнікаў Зах. Еўропы.

ДЭЭМУЛЬГАВА́ННЕ (ад *дэ...* + *эмульсія*), разбурэнне (расслаенне) эмульсій. Ажыццяўляюць мех. (цэтрыфугаванне), тэрмічнымі (награванне ці вымарожванне), эл. (уздзеянне эл. поля) і хім. метадамі (у т.л. ўвядзеннем дээмульгатараў — *паверхнева-актыўных рэчываў*, якія ўзаемадзейнічаюць з эмульгатарамі і нейтралізуюць іх уздзеянне). Выкарыстоўваюць у нафтапрамысловасці (абязводжванне і абяссольванне сырой нафты), харч. прам-сці (выраб сметанковага масла), гідраметалургіі і інш.

ДЭЭТНІЗА́ЦЫЯ, страта нацыянальнаспецыфічнага ў культуры, мове і побыце *этнасу*; згортванне або выцясненне нац. форм грамадскага жыцця. З'яўляецца вынікам змяненняў, якія адбываюцца ў ходзе *этнічных працэсаў*, укаранення або добраахвотнага засваення адным народам мовы, культуры і інш. этнічных прыкмет другога народа. Гіст. прыклады Д. — пашырэнне грэч. культуры на краіны Усх. Міжземнамор'я ў эпоху эліпізму, насаджэнне Рымам сваіх законаў і звычаяў на падуладных тэрыторыях Зах., Паўд.-Усх. Еўропы і М.Азіі, *асіміляцыя* немцамі зах.-слав. плямён у бас. Эльбы і Одэра ў 10—12

ст.; слав. каланізацыя і асіміляцыя балцкага насельніцтва ў 6—8 ст., польскае культ.-моўнае ўздзеянне на бел. этнас у Рэчы Паспалітай і рускае — у Рас. імперыі і СССР. Суправаджаецца ўпадкам нац. культуры, дэфармацыямі менталітэту, самасвядомасці нацыі, аслабленнем механізмаў яе самазахавання як самаст. этнасу. У гэтым сэнсе Д. азначае адмаўленне ад нац. моў і культур, традыцый, звычаяў і нац. самабытнасці ў цэлым. Д. нельга атаясамліваць з аб’ектыўным працэсам *інтэрнацыяналізацыі*, які мае на мэце не адмову ад нацыянальнага, а яго захаванне і развіццё, уздым да ўзроўню інтэрнацыянальнага.

С.Ф.Дубянецкі.

ДЭ-ЮРЭ (лац. de jure літар. паводле права), у міжнародным праве поўнае, афіцыйнае і канчатковае прызнанне дзяржавы або ўрада. Гл. таксама *Дэ-факта*.

Д’ЯБАЛ (грэч. diabolos літар. паклёпнік), у рэлігійным уяўленні злы дух, князь цемры, увасабленне злога пачатку на зямлі. Д. — вобраз сінтэтычны, сфарміраваўся ў старажытнасці, мае сац. і гнасеалагічныя карані. Яго гіст. крыніцай з’яўляюцца стараж.-ўсх. рэлігіі. Уяўленні славян аб Д. звязаны з міфалагічнымі канцэпцыямі аб чорце, злых духах, ведзьмаках. Уяўляецца ў выглядзе змея, дракона, страшэннай істоты, пакрытай доўгай поўсцю, з рагамі і капытамі. У зямным жыцці ён натхняльнік усіх нячыстых сіл, у замагільным — уладар *пекла*. У хрысціянстве ён — вельзевул, люцыпар, анёл, які з-за пыхі і зайздрасці нібыта выгнаны Богам з неба. Менавіта ён у асобе змея-спакусніка з’явіўся першапрычынай грэхападзення чалавека. Аналагічныя вобразы ёсць у інш. міфалогіях (у мусульманскай — шайтан, будысцкай — мара). Вобраз Д. выкарыстоўваецца ў фальклоры, нар. творчасці. *Т.І.Адула.*

Е

Е, шостая літара бел. і некаторых інш. слав. алфавітаў. Паходзіць з кірыліцкай є («есть»), утворанай на аснове візант. ε («эпсілон»). У старабел. пісьменстве мела варыянты ѥ, ҽ, ε (дапамагаюць палеографам вызначыць, калі напісаны помнік) і лічбавае значэнне 5. У 16 ст. акрамя рукапіснай набыла друкаваную форму. У сучаснай бел. мове абазначае нелабіялізаваны галосны «э» пярэдняга раду сярэдняга пад'ёму і мяккасць папярэдняга зычнага («глеба — гл'эба»), а ў пач. слова, пасля галосных, «ў», «ь» і апострафа — 2 гукі («й» і «э»): «ежа» («йэжа»), «свае» («свайэ»), «саўе» («саўйэ»), «лье» («л'йэ»), «аб'езд» («аб'йэзд»). *А.М.Булыка.*

Е́ВА (стараж.-яўр. Х а в а крыніца жыцця), паводле *Біблії* і *Карана*, жонка *Адама*, створаная *Богам* з адамавага рабра; першая жанчына на свеце і прамаці ўсіх людзей. Паводле падання, Е. першая парушыла боскае прадпісанне: паспытала ў Эдэме (раі) сама і ўгаварыла Адама паспытаць «забаронены плод з дрэва пазнання дабра і зла». За гэта яны былі пазбаўлены бессмяротнасці і выгнаны з раю. У хрысціянстве гэта паданне тлумачыцца як грэхападзенне або першародны грэх.

«ЕВА́НГЕЛЛЕ ВУЧЫ́ЦЕЛЬНАЕ», помнік старажытнабеларускага кнігадрукавання, першае на Беларусі друкаванае евангелле. Выдадзена І.*Фёдаравым* і П.*Мсціслаўцам* у 1569 у Заблудаве на царк.-слав. мове. Уключае таксама творы візант., балг. і стараж.-рус. пісьменнасці, у т.л. «Слова на ўшэсце Кірылы Тураўскага». Мае прадмову, напісаную гетманам ВКЛ Р.Хадкевічам.

Надрукавана фарматам у аркуш (407 аркушаў) з выкарыстаннем паўустаўнага шрыфту маск. выдання «Апостал». У аздобе спалучаны рысы маск. і бел. кнігадрукавання: тытульны ліст, гравюры з выявай герба Хадкевіча (мяркуюць, што выканаў Мсціславец), 3 застаўкі, 6 канцовак, 2 ініцыялы, 77 ламбардаў (дробных ініцыялаў). Застаўкі выкананы ў т.зв. старадрукарскім стылі (спалучэнне адлюстраванняў акантавага ліста, кедравых шышак, граната і інш.) белымі лініямі па чорным фоне (двойчы) і чорнымі па белым. Вядома больш за 40 экзэмпляраў. «Е.в.» неаднаразова перавыдавалася. *В.Ф.Шматаў.*

«ЕВА́НГЕЛЛЕ НАПРАСТО́ЛЬНАЕ», помнік старажытнабеларускага кнігадрукавання. Выдадзена П.*Мсціслаўцам* у 1575 у Вільні на царк.-слав. мове.

Надрукавана фарматам у аркуш буйным шрыфтам, які спалучае рысы паўустава рус. і бел. рукапісаў. «Е.н.» — асобны тып кнігі, своеасаблівы фаліянт з гравіраванымі франтыспісамі (выявы евангелістаў Іаана, Лукі, Матфея, Марка; мяркуюць, што ксілаграфіі з выявамі евангелістаў зрабіў Мсціславец), якія выкананы ў маньерысцкім стылі і вызначаюцца дэкаратыўнасцю. У трактоўцы фону, што складаецца з арх. дэталей, раслінных матываў, стылізаваных выяў жывёл і інш., спалучаны рысы готыкі і рэнесансу. Змешчана таксама 11 застawак і 4 ініцыялы. Застаўкі нагадваюць т.зв. старадрукарскі арнамент (адлюстраванні акантавага ліста, кедравых шышак, граната і інш.), іх узор выкананы чорнымі лініямі па белым фоне. Выкананыя на высокім для таго часу ўзроўні тэхнікі гравіравання дрэварыты, застаўкі, ініцыялы, а таксама шрыфт з'явіліся ўзорам для шматлікіх выданняў бел., рус., укр. друкарняў.

В.Ф.Шматаў.

ЕВА́НГЕЛІІ (грэч. euangelion літар. добрая вестка), раннехрысціянскія творы пра жыццё і вучэнне Ісуса Хрыста. Узніклі на мяжы 1—2 ст. н.э., аўтарамі Е. лічаць апосталаў або іх вучняў. Е. падзяляюцца на кананічныя — ад Матфея, Марка, Лукі і Іаана (уваходзяць у *Новы Запавет*) і апакрыфічныя (гл. *Апокрыфы*). На Беларусі Е. бытуюць з 10 ст. Найбольш стараж. Е., якія дайшлі да нас, — Тураўскае (11 ст.), Аршанскае (13 ст.), Полацкія (12—14 ст.), Мсціжскае (13—14 ст.), Друцкае, Лаўрышаўскае (14 ст.), Жыровіцкае (15 ст.), Шарашоўскае (16 ст.; гл. адпаведныя артыкулы). Евангельскія сюжэты, вобразы, прытчы, сімвалы шырока выкарыстоўвалі ў літ. і асветніцкай дзейнасці Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Ф.Скарына, В.Цяпінскі (першы надрукаваў Е. на старабел. мове), С.Будны, Л. і С.Зізаніі, Л.Карповіч, М.Сматрыцкі, А.Філіповіч і інш. Сюжэты, змест і вобразы Е. выкарыстоўвалі майстры скульптуры, жывапісу, кніжнай графікі, пісьменнікі (Сімяон Полацкі, М.Багдановіч, Я.Колас, К.Крапіва, У.Караткевіч і інш.).

Літ.: К о н а н У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. Мн., 1989.

ЕВА́НГЕЛЬСКІЯ ХРЫСЦІЯ́НЕ, паслядоўнікі адной з плыней *пратэстантызму*, падобнай да баптызму (гл. *Баптысты*). Найб. распаўсюджаны ў ЗША. У Расіі з'явіліся ў 1870-я г. ў арыстакратычным асяроддзі Пецярбурга. Першапачатковая назва — рэдстакісты або пашкоўцы (ад імён актыўных прапаведнікаў лорда Рэдстака і палкоўніка В.А.Пашкова). З сярэдзіны 1890-х г. наз. Е.х. У 1909 засн. Усерасійскі Саюз Е.х. на чале з І.С.Праханавым і адбыўся іх 1-ы з'езд у Пецярбургу. У аснову веравучэння, распрацаванага Праханавым, былі пакладзены агульнапратэстанцкія догматы: вучэнне аб спрадвеч-


ЄВАНГЄЛІЄ
АБО
КНІГА ЖЫЦЦЯ ВЕЧНАГА
І Свята Брацтвам,
ПРЕЗ
Стого Ѳеофіла КАЛІСТА, Архіепіскапа
Канстантынопольскага, і Вялікага Патрыярхі, пры
дадатку Жыцця Пятрыцкіх напісанае,
АТЭПЕРАНОЕ
З Керыцкага і Славянскага языка на
Рускій пераложэнае.

Да арт. **Евангелій**. «Евангелие вучыцельнае» Каліста. Еўе. 1616.

най грахоўнасці чалавека і выратавальнай місіі Ісуса Хрыста; догмат аб другім прышэсці Хрыста і магчымасці выратавання толькі асабістай верай у выратавальную ахвяру Хрыста. Іх абраднасць і царк. арганізацыя яшчэ больш спрошчаныя, чым у баптыстаў. У 1930-я г. шмат кіраўнікоў Саюза Е.х. і вернікаў было рэпрэсіравана, дзейнасць яго фактычна спынілася; адноўлена ў 1942. У 1944 Е.х. аб'ядналіся з баптыстамі ў царкву *Евангельскіх хрысціян-баптыстаў* (Саюз ЕХБ). На Беларусі першыя паслядоўнікі Е.х. (пашкоўцы) з'явіліся ў 1870—90-я г. на Гомельшчыне. У 1920—30-я г. ў Зах. Беларусі замежныя місіі заснавалі шэраг абшчын Е.х., у асноўным у Палескім ваяв. Цяпер большасць Е.х. уваходзіць у Саюз ЕХБ Беларусі. 1 абшчына Е.х. зарэгістравана аўтаномна (1997). *А.У.Верашчагіна.*

ЕВА́НГЕЛЬСКІЯ ХРЫСЦІ́ЯНЕ-БАПТЫ́СТЫ, Саюз ЕХБ, царква, якая ўзнікла на тэр. СССР у 1944 у выніку зліцця пратэстанцкіх плыней — *баптыстаў* і *евангельскіх хрысціян*. Кіруючым органам царквы ЕХБ да 1991 быў Усесаюзны савет ЕХБ (УСЕХБ). У 1945—47 да Саюза ЕХБ далучылася частка пяцідзесятнікаў, у 1963 — «брацкія менаніты». Царк. арганізацыя, парадак набажэнства, абраднасць і царк. дысцыпліна ЕХБ грунтуюцца на прынцыпах баптыстаў, веравучэнне — на палажэнні евангельскіх хрысціян. Пяцідзесятнікі адмовіліся ад гласалалій (гаварэння на «іншамовах»). У 1960-я г. з Саюза выйшла найб. кансерватыўная частка вернікаў і стварыла Савет цэркваў ЕХБ. Некат. з іх па-ранейшаму адмоўна ставяцца да рэгістрацыі. У 1947 з Саюза выйшла частка пяцідзесятнікаў, у 1980-я г. выхад пяцідзесятніцкіх суполак набыў масавы характар. Існуе Саюз ЕХБ Беларусі, які ўваходзіць у Сусв. саюз баптыстаў. На 1.1.1998 у Рэспубліцы Беларусь 209 зарэгістраваных суполак ЕХБ і 33 незарэгістраваныя суполкі Савета цэркваў ЕХБ. *А.У.Верашчагіна.*

«ЕВРОПЕ́ЙСКОЕ ВРЕ́МЯ», грамадска-палітычная газета. Выдавалася ў 1992—95 у Мінску на рус. мове раз у месяц. Заснавальнік і гал. рэдактар С.У.Букчын. Змяшчала матэрыялы пра сац.-паліт., эканам., нац.-культ. падзеі ў Беларусі, перадрукоўвала артыкулы з зах. перыяд. выданняў.

ЕГАРЭ́НКАВА Галіна Іванаўна (13.5.1942, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 9.2.1989), рускі і бел. крытык і літ.-знавец. Канд. філал. н. (1973). Скончыла Горкаўскі ун-т (1965). Працавала ў Мінскім пед. ін-це, Бел. тэатр.-маст. ін-це, з 1980 у Горкаўскім пед. ін-це. Даследавала рус. класічную л-ру (Ф.Дастаеўскі, Л.Талстой, М.Гогаль, А.Пушкін, М.Салтыкоў-Шчадрын і інш.), бел. прозу (творы А.Адамовіча, Г.Далідовіча, В.Казько, І.Пташнікава, І.Чыгрынава, І.Шамякіна і інш.).

Тв.: Духовная жажда. Горький, 1983; Земная основа. Горький, 1987; Звено связующее. Мн., 1990.

ЕГЕР (ад ням. Jäger паляўнічы), службовая асоба ў паляўнічых гаспадарках ці заказніках; спецыяліст-паляўнічы, які абслугоўвае паляўнічых-аматараў. За Е. замацавана акрэсленая тэр. (егерскі ўчастак), дзе ён ажыццяўляе ахову ўгоддзяў, звяроў і птушак, прымае ўдзел у арганізацыі паляванняў, правядзенні біятэхн. мерапрыемстваў і работ па ўліку паляўнічых жывёл; кантралюе выкананне правіл прыродакарыстання і законаў аб паляванні.

ЕГЕРСКАЯ СЛУ́ЖБА, служба аховы паляўнічага дзярж. фонду. У асобных краінах ствараецца для нагляду за выкананнем правіл палявання і барацьбы з браканьерствам, правядзення выхаваўчай і тлумачальнай работы з паляўнічымі і насельніцтвам, уліку дзікіх жывёл, арганізацыі палявання і паляўніча-гасп. работ. Існуе Е.с. штатная і на грамадскіх пачатках. На Беларусі штатная Е.с. арганізавана ў паляўнічых і лесапаляўнічых гаспадарках. Участкі паляўнічых угоддзяў (егерскія абходы) замацоўваюцца за *егерамі*. На гэтых тэрыторыях егеры ажыццяўляюць ахову ўгоддзяў, звяроў і птушак, якія там жывуць, удзельнічаюць у арганізацыі палявання, правядзенні біятэхн. мерапрыемстваў і работ па ўліку колькасці паляўнічых жывёл.

ЕГІПЕТ Старажытны, старажытная дзяржава ў ніжнім цячэнні р. Ніл, у паўн.-ўсх. Афрыцы.

Гісторыя. Стараж.-егіп. цывілізацыя налічвае больш за 3 тысячагоддзі. У яе развіцці вылучаюць некалькі асн. этапаў, ці царстваў (Ранняе, Старажытнае, Сярэдняе і Новае), а таксама Позні перыяд і некалькі пераходных эпох. Цары

(фараоны), якія правілі краінай, яшчэ ў старажытнасці былі падзелены на 30 дынастый, што таксама лягло ў аснову перыядызацыі гісторыі гэтай цывілізацыі.

Паселішчы на тэр. Е. вядомы з эпохі палеаліту. У 10—6-м тыс. да н.э. вандроўныя плямёны, як мяркуюць, протасеміты, берберы, кушыты і інш., жылі ў стэпах уздоўж Ніла, дэльта і даліна якога былі часткова забалочаны. Змена клімату ў эпоху неаліту вымусіла іх перасяліцца ў пойму Ніла. У 4-м тыс. да н.э. ў выніку змяшання гэтых плямён склаўся егіп. народ. З часам узніклі прымітыўныя дзярж. ўтварэнні, ад якіх пайшлі адм. акругі, т.зв. *номы* (налічвалася каля 40). Каля сярэдзіны 4-га тыс. да н.э. ўтварыліся 2 буйныя царствы — Верхні Е. і Ніжні Е. Прыкладна каля 3000 да н.э. цар Верхняга Е. Менес захапіў Ніжні Е., заснаваў крэпасць *Мемфіс* (з 28 ст. да н.э. сталіца Е.) і аб'яднаў абедзве дзяржавы. Пачалася гісторыя адзінай краіны Е.

У перыяд Ранняга царства (30—28 ст. да н.э., I—II дынастыі) удасканальваліся каменныя і медныя прылады працы, пашырыўся менавы гандаль, развівалася ірыгацыйная гаспадарка. Фарміраваўся дзярж. апарат, вылучыліся номы на чале з намархамі. Вяліся войны з кушытамі (нубійцамі) на Пд, лівійцамі на ПнЗ, бедуінамі Сінайскага п-ва на ПнУ. На царскі трон прэтэндавалі 2 роды, якія пакланяліся багам Верхняга Е. *Гору* і *Сету*, перамаглі прыхільнікі Гора, якія сталі апекунамі царскай улады. Значнага прагрэсу дасягнула ткацкае рамяство, пачаўся выраб папірусу для пісьма.

У час Старажытнага царства (28—23 ст. да н.э., III—VI дынастыі) дзяржава зведала эканам. і культ. ўздым. Адзінства Е. ўвасаблялася ва ўладзе фараона, які быў неабмежаваным гаспадаром усёй краіны. Побач з абшчынным узнікла прыватнае землеўладанне, умацаваўся бюракратычны апарат, створана пастаяннае войска. Неабмежаваная ўлада фараонаў выявілася ў буд-ве пахавальняў-пірамід (Хеопса, Хефрэна, Мікерына і інш.). Распаўсюдзіўся культ бога *Ра*, фараоны называлі сябе яго сынамі. У гэты перыяд узмацніліся паліт. і эканам. сувязі Е. з Фінікіяй і краінай Куш (Нубія). Фараоны Снофру і Сахура рабілі ваен. набегі на Фінікію, адкуль дастаўлялі драўніну для буд-ва караблёў. З Куша паступалі золата, слановая косць, жывёла, духмяныя рэчывы, рабы. З цягам часу ўлада фараонаў прыйшла ў заняпад і дзяржава распалася на номы.

Першая пераходная эпоха (23—21 ст. да н.э., VII—XI дынастыі). Пасля смерці фараона Піопі II, які панаваў 94 гады, пачаўся доўгі перыяд паліт. раздробленасці і барацьбы за трон. Ён характарызаваўся эканам. і культ. заняпадам, сац. хваляваннямі,

якія часам набывалі форму нар. паўстанняў супраць намархаў. Вялікім уплывам у гэты час карысталіся правіцелі Геліопаля, якія падпарадкавалі цэнтр. Е. і дэльту Ніла, а таксама правіцелі Фіваў у Верхнім Е. У выніку войнаў перамог фіванскі правіцель Ментухатэп I, які ў сярэдзіне 21 ст. да н.э. зноў аб'яднаў краіну пад сваёй уладай.

Сярэдняе царства (21—18 ст. да н.э., XII—XIII дынастыі). У часы XI дынастыі адноўлена цэнтр. адміністрацыя, але сапраўднае развіццё Е. прыпала на перыяд XII дынастыі. У выніку рэформ вырас аўтарытэт фараона і абмежавана незалежнасць намархаў, ліквідавана спадчыннасць службовых пасад; сталіца перанесена ў цэнтр Е., побач з Фаюмскім аазісам, дзе праведзены вялікія меліярац. работы. Развіваўся замежны гандаль (з Крытам,

Да арт. **Егіпет** Старажытны. Галава царыцы Неферціці з майстэрні ў Ахетатоне. XVIII дынастыя. 1-я чвэрць 14 ст. да н.э.

Пунтам, Сірыяй, М. Азіяй і Месапатаміяй), створана прафес. армія, пабудавана сістэма ўмацаванняў ва ўсх. ч. дэльты Ніла і ў ніжняй Нубіі. На гэты перыяд прыпадае росквіт л-ры і мастацтва.

Другая пераходная эпоха (18—16 ст. да н.э., XIV—XVIII дынастыі). Негатыўным вынікам ліквідацыі Сенусертам III спадчыннасці дзярж. пасад стаў арганізац. хаос, які праявіўся пасля смерці апошняга фараона XII дынастыі *Аменемхета III*. Нестабільнасць цэнтр. улады ў перыяд XIII—XIV дынастый выклікала аслабленне Е. Каля 1650 да н.э. краіна трапіла ў залежнасць ад семіцкіх плямён *гіксосаў*, якія заснавалі сталіцу ва ўсх. ч. дэльты Ніла (Аварыс) і панавалі як XV і XVI дынастыі. У сярэдзіне 16 ст. да н.э. фіванскія ўладары перамаглі гіксосаў і зноў аб'ядналі краіну.

Новае царства (16—11 ст. да н.э., XVIII—XX дынастыі). З прыходам да ўлады XVIII дынастыі пачаўся перыяд найвыш. магутнасці Е. Тутмос I і Тутмос III пашырылі межы краіны, стварылі імперыю, якая займала тэр. ад Еўфрата на Пн да 4-га парога на Ніле на Пд. Гэта ўвяло Е. у сферу інтарэсаў інш. блізкаўсх. дзяржаў, стала прычынай пастаянных канфліктаў за панаванне ў Сірыі і Палесціне. У распараджэнні фараона засталася адносна невял. ч. зямель. Спроба змяніць гэтую сітуацыю складала сутнасць т.зв. рэформы *Аменхатэпа IV*. Пасля яе ліквідацыі ўлада перайшла да арміі (XIX дынастыя). Цары Сеці I і Рамсес II працягвалі імперскую палітыку папярэднікаў. Дагавор Рамсеса II з хетамі (каля 1260 да н.э.) забяспечыў Е. доўгі перыяд стабільнасці, паспрыяў развіццю манум. храмавага буд-ва. Эканам. і паліт. роля храмаў выросла яшчэ больш, дамінуючае значэнне меў дзярж. культ *Амона* фіванскага. Сталіца дзяржавы перанесена ва ўсх. ч. дэльты Ніла (Пер-Рамсес). У часы Мернептаха і Рамсеса III пачалася серыя абарончых войнаў з т.зв. народамі мора (група ваяўнічых плямён, што прыйшлі з Пн) і лівійцамі. Войнам спадарожнічалі ўнутр. барацьба за ўладу і глыбокі эканам. крызіс (інфляцыя, бунты). У часы XX дынастыі гэтыя негатыўныя з'явы ўзмацніліся. Рост значэння арміі і эканам. незалежнасці вышэйшых саноўнікаў і храмаў побач з абмежаванымі магчымасцямі цэнтр. улады ў часы панавання Рамсеса XI прывёў да грамадз. вайны і адхілення фараона ад улады арміяй, а таксама абвяшчэння надзвычайнага становішча. У Е. ўзніклі 2 цэнтры ўлады: Таніс (цары XXI дынастыі, 11—10 ст. да н.э.) і Фівы (т.зв. дзяржава Амона пад кіраўніцтвам жрэчаскай дынастыі).

Трэцяя пераходная эпоха (11—7 ст. да н.э., XXI—XXV дынастыі) і Позні перыяд (7—4 ст. да н.э., XXVI—XXX дынастыі). У 10 ст. да н.э. значны ўплыў у аслабленай дзяржаве мелі лівійскія пасяленцы, якія з часоў лівійскіх войнаў Мернептаха і Рамсеса III жылі ў шматлікіх калоніях, асабліва ў Ніжнім Е. Лівійскі правадыр Шэшонк легальна ўзяў уладу ў 945 да н.э. і заснаваў XXII дынастыю. Паліт. і эканам. сітуацыя ў краіне была нестабільная. Барацьбу за ўладу паміж лівійскімі правадырамі выкарысталі заваёўнікі з Пд (Куш) і завалодалі Е. (XXV дынастыя, т.зв. эфіопская). У 671 да н.э. паўн. Е. часова трапіў пад уладу асірыйцаў. Выкарыстаўшы канфлікты паміж асірыйскімі і кушыцкімі заваёўнікамі, уладары Саіса Неха I і Псаметых I захапілі ўладу ў краіне. Пачаўся апошні перыяд росквіту Е. — панаванне XXVI дынастыі (т.зв. саіскі рэнесанс). Ён характарызаваўся паліт. незалежнасцю, эканам. і культ. адраджэннем. Е. праводзіў актыўную знешнюю палітыку ў Азіі, паспяхова адбіваў уварванні вавіланян. У 525 да н.э. напад на перс. цара Камбіса паклаў канец незалежнасці Е. Ён ператварыўся ў сатрапію Перс. імперыі (за выключэннем кароткага перыяду незалежнасці ў часы XXIX і XXX дынастый). У выніку паходу *Аляксандра Македонскага* Е. трапіў пад уладу Македоніі (332 да н.э.). У 305 да н.э. македонскі намеснік заснаваў уласную дынастыю (гл. *Пталамеі*), якая правіла ў Е. да рым. завалявання ў 30 да н.э. *Аўгуст* уключыў Е. у Рымскую імперыю і ператварыў яго ў правінцыю. У 639—641 н.э. Е. завяваны араб. войскамі халіфа Умара.

Пра вывучэнне гісторыі і культуры Е. гл. ў арт. *Егіпталогія*.

Асвета. Школы ў Стараж. Е. прызначаліся для навучання будучых дзярж. чыноўнікаў — пісцоў. У перыяд Стараж. царства яны існавалі пры палацы фараона, пазней з'явіліся школы пры храмах, а ў перыяд Новага царства — і пры буйных дзярж. установах. Тут займаліся хлопчыкі ва ўзросце ад 5 да 16 гадоў. Перш за ўсё яны вучыліся чытаць і пісаць на паліраваных пласцінках вапняку, разграфлёных у лінейку ці клетку. У Фівах карысталіся груба абчасанымі каменнымі асколкамі. Школьнікі вучыліся выводзіць на іх іерогліфы ці скарапісныя знакі, рабіць невял. малюнкі, а пазней перапісвалі ўрыўкі тэкстаў. Авалодаўшы пісьмом, вучань атрымліваў доўгі вузкі скрутак папірусу, на якім пісаў пэндзлікам чырвонымі і чорнымі фарбамі. Кожны пісец быў таксама графічным мастаком. Вялікая ўвага аддавалася лічэнню: вучням прапаноўваліся задачы, якія мелі вузкапрактычны характар (вылічэнне аб'ёму свірнаў, плошчы поля, вызначэнне неабходнай колькасці рабочай сілы і інш.). Яны павінны былі ведаць законы і ўлажэнні, гісторыю і геаграфію, разбірацца ў асновах тэхнікі. Апрача вучэбных прадметаў у школах навучалі гімнастычным практыкаванням, плаванню, добрым манерам. У школах пры храмах разам з агульнымі прадметамі давалі рэліг. адукацыю, навучалі астраноміі і медыцыне. Вучні звычайных школ жылі дома. Дзяцей вышэйшай знаці ў юным узросце адлучалі ад сям'і і аддавалі ў ваен. школы, дзе рыхтавалі вайсковых начальнікаў.

Прыродазнаўчыя навукі. Тэхніка. Матэм. і астр. веды ў Стараж. Е. мелі чыста эмпірычны, дастасавальны характар і выкарыстоўваліся ў ірыгацыі, будаўніцтве і дзярж. кіраўніцтве. Егіпцяне ўпершыню ўвялі дзесятковую сістэму лічэння, у эпоху Сярэдняга царства ўзніклі элементарныя алгебраічныя ўяўленні. Найб. стараж. прылады працы палеаліту — рубілы з крэменю і рагавіку. У 4-м тыс. да н.э. пачалося выкарыстанне абсідыяну (вулканічнага шкла), першыя с.-г. прылады (матыкі, сярпы і інш.) выраблялі з каменю, дрэва і косці. У гэты ж час з'явіўся ганчарны круг, развіваліся керамічная і ткацкая вытворчасць, выраб фаянсу, з 3-га тыс. да

н.э. — шкла. У 2-м тыс. да н.э. з'явіліся жалезныя вырабы, упрыгожанні з золата і серабра. Ужо ў дадынастычную эпоху пачалі будаваць каналы і дамбы. Для абваднення палёў выкарыстоўвалі журавель, пазней — водапад'ёмнае кола. У эпоху Ранняга царства з'явіўся плуг. Асн. буд. матэрыяламі былі гліна і трыснёг. Пры ўзвядзенні палацаў фараонаў і крэпасцей выкарыстоўвалі цэглу-сырэц, храмы і царскія пахавальні (піраміды) будавалі з каменю, апрацоўваць які егіпцяне навучыліся дасканала. Асноўныя шляхі зносін праходзілі па р. Ніл. Вялікія лодкі рознай формы і прызначэння будавалі з дадынастычнай эпохі. Для зносін з інш. краінамі карысталіся марскімі суднамі. У 18 ст. да н.э. з'явіўся колавы транспарт. Гандлёвыя і ваен. экспедыцыі егіпцян у Сірыю, па р. Ніл у Куш, экватарыяльныя раёны Афрыкі і інш. абумовілі назапашванне і пашырэнне геагр. ведаў. Бальзамiраванне памерлых спрыяла развіццю анатамічных ведаў і ўзбагачэнню хірургічнага вопыту. Егіпецкія ўрачы рабілі трэпанацыю чэрапа, пламбіравалі зубы, накладвалі хірургічныя шыны. Аднак зусім рэалістычныя ўяўленні перапляталіся з верай у магію і вядзьмарства. Муміфікацыя, выраб духмяных рэчываў, лакаў і фарбаў спрыялі развіццю хіміі. Веды стараж. егіпцян значна паўплывалі на развіццё антычнай, а значыць і еўрапейскай, навукі.

Міфалогія і рэлігія. Карані рэліг. вераванняў стараж. егіпцян у культах мясц. багоў, якія шанаваліся ў выглядзе розных жывёл, а пазней — людзей (Анубіс, Баст, Гор, Хатар, Себек) у асобных гарадах ці номах, што ўваходзілі ў склад Е. ў дагіст. часы. Апрача іх існавала група божстваў прыроды, якіх ушаноўвалі на тэр. ўсяго Е.: Ра (Сонца), Хапі (Ніл), Нун (акіян). У працэсе фарміравання дзяржавы і паліт. барацьбы за вяршэнства ў краіне божствы ўз'яднаных рэгіёнаў падпарадкоўваліся (тады ўзнікала якое-н. гал. божство), атаясамліваліся або злучаліся ў сямейныя саюзы: трыяды (божствы Дэльты — Асірыс, Ісіда і Гор; Птах, Сехмет і Нефертум; Амон-Ра, Мут і Хансу ў Фівах), энеады (9 божстваў, шанаваных у Геліопалі), агдаады (8 божстваў, шанаваных у Гермопалі). Егіпцяне пакланяліся таксама жывёлам, якія лічыліся ўвасабленнем божстваў (бык Апіс у Мемфісе, баран і гусь у Фівах). Падобны зоамарфізм божстваў, верагодна, бярэ пачатак у племянным *фетышызме* і *татэмізме*.

Сярод шматлікіх рэліг. асяродкаў, якія выпрацавалі ўласную тэагонію, тэалогію і касмагонію, найб. значную ролю ў фарміраванні рэліг. вераванняў егіпцян адыграў Геліопаль — цэнтр культу бога сонца Атума, які пасля атаясамлівання з богам Ра быў прызнаны стваральнікам багоў, сусвету і люсонца Атона. Догматы гэтага культу выкладзены ў гімне да новага божства, які прыпісваўся самому фараону. Пасля яго смерці фіванскія жрацы вярнулі культу Амона былое значэнне. У выніку аслаблення паліт. адзінства краіны ў Позні перыяд пэўнае значэнне набылі культы мясц. багоў (Баст, Нейт), а ў эліністычны перыяд культы Сарапіса і Ісіды распаўсюдзіліся нават па-за межамі Е.

Сістэма рэліг. вераванняў стараж. егіпцян была моцна звязана з культам памерлых і верай у паслясмяротнае існаванне. Лічылася, што замагільнае жыццё з'яўляецца працягам зямнога, а свет памерлых знаходзіцца «на Захадзе» або сярод зорак і падобны на Е. Шлях да яго быў поўны перашкод і небяспекі, пераадолець якія дапамагалі закляцці і магічныя формулы, выбітыя на сценах пахавальні (піраміды) або выпісаныя на скрутках папірусу, што клаліся ў магілу. Апошнім этапам быў суд Асірыса. Пасля суда памерлы або трапляў у краіну Асірыса, або яго паядаў дэман. Умовай прадаўжэння жыцця ў замагільным свеце было забеспячэнне цела ад знішчэння, адсюль звычай бальзаміраваць трупы і змяшчаць іх у добраўпарадкаваныя пахавальні. Неад'емным элементам рэліг. вераванняў стараж. егіпцян была магія. У штодзённым жыцці варажба, храмавыя праройствы, каляндарныя прадказанні вырашалі сумненні і кіравалі паводзінамі людзей. Амулеты і магічныя дзеянні павінны былі засцерагаць іх ад небяспекі і ў свеце жывых, і ў свеце памерлых.

Літаратура. Найб. старажытныя літ. помнікі Е. ўзніклі ўжо ў самы ранні перыяд існавання дзяржавы. Тэксты на егіп. мове выбівалі на стэлах і сценах пахавальняў, пісалі на астраконах і па-

Да арт. **Егіпет** Старажытны. Храм царыцы Хатшэпсут у Дэйр-эль-Бахры. XVIII дынастыя. Дойлід Сенмут. Пач. 15 ст. да н.э.

Да арт. **Егіпет** Старажытны. Тыповы рабаўладальніцкі маёнтак (рэканструкцыя). Верагодна, эпоха Новага царства.

пірусах, карыстаючыся іерагліфічным, іератычным і дэматычным пісьмом (гл. *Егіпецкае пісьмо*). Узнікненне егіп. л-ры прыпадае на першыя стагоддзі Стараж. царства, яе росквіт, т.зв. класічны перыяд, — на эпоху Сярэдняга царства. Важнае месца займала рэлігійная літаратура, да якой належыць большая частка літ. помнікаў, у т.л. творы, звязаныя з культам памерлых. У эпоху Стараж. царства жрацы Геліопаля апрацавалі для фараонаў збор закляцяў, магічных формул і малітваў, якія павінны былі забяспечыць ім пасмяротнае жыццё на ўзор зямнога («Тэксты пірамід»). У далейшым права карыстання рэліг. тэкстамі было пашырана і на вышэйшых саноўнікаў; для іх быў апрацаваны новы збор — «Тэксты саркафагаў». Да часоў Новага царства належыць «Кніга памерлых» — новая апрацоўка рэліг. тэкстаў, створаная фіванскімі жрацамі для заможнай часткі егіп. грамадства. Апрача малітваў і заклінанняў у гэты твор уключана стараж. сістэма егіп. касмагоніі, тэагоніі, тэалогіі, а таксама т.зв. негатыўная споведзь (прызнанне ў сваёй бязгрэшнасці, якое рабілі душы памерлых на судзе Асірыса). У пахавальню клалі апісанне Царства памерлых («Кніга дзвюх дарог», «Кніга падземнай краіны», «Кніга брам», «Кніга пячор»). Найб. пашыраным жанрам была дыдактычная літаратура, якая ў форме павучанняў, сентэнцый, прыслоўяў знаёміла егіпцян з прынцыпамі этыкі, заснаванымі на практычнай жыццёвай мудрасці («Павучанні Кагемні», «Павучанні Харджэдэфа», «Павучанні Птахатэпа»). Да перыяду Сярэдняга царства належаць «Павучанні Наферці» і «Павучанні Аменемхета» (паліт. завяшчанне сыну Сенусерту I). Яны з'яўляюцца працягам песімістычнай плыні ў егіп. л-ры, да якой належыць і адзін з яе найцікавейшых літ. помнікаў — філас. трактат «Спрэчка расчараванага са сваёй душой». «Павучанні Хеці, сына Дуауфа» ўяўляюць сабой сатыру на ўсе прафесіі, але пахвалу працы пісца. «Павучанні Аменемопе» (Новае царства) некат. даследчыкі лічаць крыніцай біблейскіх «Прытчаў цара Саламона». Апошнія помнікі гэтага жанру адносяцца да пач. Рымскай эпохі. Уласна мастацкая літаратура зарадзілася ўжо ў перыяд Стараж. царства, але пераважная ч. яе помнікаў належыць да больш позніх эпох. Найб. раннімі паэт. жанрамі былі песні («Песня арфіста»), гімны ў гонар багоў («Гімн Нілу», «Гімн Атону», прысвяціліся Аменхатэпу IV) або фараонаў (Сенусерта III, Сярэдняе царства). У надмагільных надпісах часоў Стараж. царства сустракаюцца фрагменты любоўнай лірыкі; захавалася некалькі зборнікаў ад часоў яе росквіту (Сярэдняе і Новае царствы). Да розных эпох належаць тэксты, якія сведчаць пра існаванне драмы: т.зв. «Драматычныя тэксты» юбілейных цырымоній (Сярэдняе царства), фрагменты алегарычнай драмы «Вяртанне Сета», у якой выказаны пратэст супраць панавання персаў (Позняя эпоха), «Жальбы Ісіды і Нефтыды», звязаныя з містэрыямі ў гонар Асірыса (Грэч. эпоха). Папулярным жанрам была аповесць, якая развілася з аўтабіягр. надпісаў канца Стараж. царства: «Прыгоды Сінухета», «Пацярпелы крушэнне», «Красамоўны селянін», а таксама «Апавяданне пра дзівосныя здарэнні» (Сярэдняе царства). У наступны перыяд створаны апавяданні фантаст. («Праўда і Крыўда», «Два браты»), міфалагічныя («Гор і Сет»), гіст. («Спрэчка цара Апопе з Секененрам», «Кадэшская паэма») і падарожныя («Прыгоды Венамона»). У Познюю эпоху ўпершыню ў сусв. л-ры з'явіліся 4 байкі пра жывёл у форме філас. дыялога («Сонечнае вока»). Да жанру гістарычнай літаратуры належаць аўтабіяграфіі, шматлікія дзярж. і прыватныя дакументы (дэкрэты фараонаў, інструкцыі, судовыя пратаколы), гадавікі Тутмоса III з апісаннем яго ваен. перамог, т.зв. стэла Ізраіля, якая праслаўляла перамогу Мінептаха над палесцінскімі плямёнамі. На часы Новага царства прыпадае росквіт эпісталярнага жанру. Навуковая літаратура ўключае мед., матэм. і геам. папірусы, якія сведчаць пра высокі ўзровень развіцця дакладных навук у Е. Панаванне чужаземных уладароў (перс., грэч., рымскіх) паступова прывяло да знікнення л-ры на роднай мове. З 2 ст. н.э. яе замяніла копцкая, а з сярэдзіны 7 ст. араб. л-ра.

Да арт. **Егіпет** Старажытны. Палетка фараона Нармера з Іераконпаля. I дынастыя. Каля 3000 г. да н.э.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Мастацтва Е., цесна звязанае з рэлігіяй, у т.л. з замагільным культам, увасабляла ўяўленне аб непарушнасці сац. ладу і звышчалавечай велічы абагаўлёнага фараона. Пошукі эфектыўнай маст. мовы прывялі да стварэння першага *канона*. Былі асэнсаваны і выпрацаваны асн. сродкі пластычных мастацтваў: аб'ём, маса, апора, скляпенне, рытм — у архітэктуры; плоскасць, лінія, сілуэт, колеравая пляма — у рэльефе і жывапісе; тэкстура і фактура каменя і дрэва — у скульптуры. У Е. былі выпрацаваны класічныя арх. формы і тыпы (піраміда, абеліск, калона), віды выяўл. мастацтва (круглая скульптура, рэльеф, манум. жывапіс і інш.). Асн. прынцыпы мастацтва Е. пачалі складвацца каля 3000—2000 да н.э. Гал. роля належала архітэктуры (грабніцы-мастабы). Яе прынцыпы манументальнасці і статычнасці ўплывалі на развіццё скульптуры і жывапісу, якім таксама ўласціва геам. абагульненасць, сіметрыя і статыка, строгая франтальнасць (палетка фараона Нармера, статуя фараона Хасехема). У перыяд Стараж. царства гэтыя маст. прыёмы набылі стылістычную завершанасць. Быў выпрацаваны новы тып пахавальні фараона — піраміда, у якой прастата формы ў спалучэнні з велізарнымі памерамі стварала велічны арх. вобраз (піраміды ў Сакары і Гізе). Вакол пірамід ствараліся замагільныя комплексы (памінальныя храмы, злучаныя доўгімі крытымі калідорамі з уваходнымі павільёнамі, сфінксы, мастабы прыдворных, шэраг падземных збудаванняў). У размалёўках і рэльефах на сценах грабніц з сюжэтамі жыцця ў

Да арт. **Егіпет** Старажытны. Піраміды ў Гізе. 1-я пал. 3-га тысячагоддзя да н.э.

царстве памерлых выяўляюцца пачуццё рытму, прыгажосць абагульненай контурнай лініі, сілуэта, лакальнай колеравай плямы (рэльефы грабніц Ці і Ахатэпа ў Сакары). Вял. развіццё атрымаў скульптурны партрэт (статуі фараона Хефрэна, пісца Каі). У эпоху Сярэдняга царства піраміды страцілі грандыёзнасць. Найб. пашырэнне набылі скальныя грабніцы з 2- ці 4-калонным порцікам. Памінальныя храмы часта аддзяляліся ад грабніц, мелі падоўжную восевую кампазіцыю (храм Ментухатэпа I у Дэйр-эль-Бахры). Паскорыўся рост гарадоў, дзе будавалі мураваныя (з цэглы-сырцу) палацы з памяшканнямі, аздобленымі размалёўкамі, з калонамі і порцікамі, галерэямі, унутр. дварамі. У выяўл. мастацтве ўзмацніліся тэндэнцыі

Да арт. **Егіпет** Старажытны. Спінка параднага трона фараона Тутанхамона.

да рэалістычнасці, большай кампазіц. свабоды і спробы перадачы аб'ёму, індывідуальнасці ў падыходзе да выяўлення чалавека, насычалася каляровая гама (партрэтныя галовы і статуі фараонаў Сенусерта III і Аменемхета III, 19 ст. да н.э.). У эпоху Новага царства мастацтва Е. зведала росквіт. Змрочныя, драм. вобразы змяніліся вытанчана-арыстакратычнымі, узмацнілася імкненне да дэкар. пышнасці. У архітэктуры атрымалі развіццё папярэднія тэндэнцыі. У храме царыцы Хатшэпсут у Дэйр-эль-Бахры, часткова высечаным у скалах, строгія лініі карнізаў і калон кантрастуюць упарадкаванасцю з хаатычнымі расколінамі скал. Мякка мадэліраваныя статуі, рэльефы і размалёўкі надаюць храму гарманічную яснасць. У рэльефах лініі сталі больш вытанчанымі, удасканалілася апрацоўка каменю. Асаблівае развіццё атрымаў паглыблены рэльеф з тонкай гульнёй светлаценяў. У насценных размалёўках з'явіліся свабода рухаў і ракурсаў, тонкасць каляровых суадносін, у кампазіцыю шырока ўводзіцца пейзаж (размалёўкі грабніц у Фівах). У наземных храмах асн. элементамі сталі разгорнутыя па падоўжнай восі адкрыты двор, абнесены каланадай, гіпастыль з радамі манум. лотаса- ці папірусападобных калон і свяцілішча са статуямі багоў; уваход у храм афармляўся 2 пілонамі, перад якімі ставілі абеліскі і статуі (храмы ў Карнаку і Луксоры). У 1-й пал. 14 ст. да н.э. ў выніку рэлігійнай рэформы Эхнатона ў мастацтве Е. адбыліся значныя змены. Яму стала ўласціва палемічная абвостранасць вобразаў, амаль гратэскавая трактоўка індывід. рыс фараона і членаў яго сям'і. Скульпт. партрэты характарызуюцца арыстакратычнай вытанчанасцю і класічнай яснасцю вобразаў (партрэты Эхнатона і яго жонкі Неферціці, скульпт. Тутмес, а таксама галава Неферціці з майстэрні ў Ахетатоне). У сярэдзіне 14 ст. да н.э. гэтыя тэндэнцыі працягваліся, але набылі адценне халоднасці (знаходкі з грабніцы Тутанхамона — залатая маска, трон, пасудзіны, куфэркі з рэльефамі і размалёўкамі). У 2-й пал. 14 ст. да н.э. назіраецца імкненне да параднай пышнасці і цяжкаважкасці форм (гіпастыль храма ў Карнаку). Зноў пашырыўся скальны тып храма (*Абу-Сімбел*). У выяўл. мастацтве ўзмацнілася ідэалізацыя вобразаў фараонаў (статуі Рамсеса II у Абу-Сімбеле). Высокага ўзроўню дасягнула дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (пасудзіны з шыферу, алебастру, крышталю, залатыя ўпрыгожанні з інкрустацыяй каштоўнымі камянямі і інш.). Вырабы вылучаюцца строгай вытанчанасцю форм і дэкар. маляўнічасцю, тонкасцю апрацоўкі. Для перыяду апошняга росквіту мастацтва Е. (7 ст. да н.э.) характэрны зварот да старых традыцый, эклектычнае спалучэнне маст. прыёмаў розных эпох. Старанна апрацаваныя і адпаліраваныя статуі і рэльефы пазначаны ўнутр. адасобленасцю. Некат. творы маюць выразную партрэтную характарыстыку (статуя Мантуэмхета). Пасля заваявання краіны Аляксандрам Македонскім (4 ст. да н.э.) мастацтва Е. ўключылася ў сферу эліністычнага мастацтва, пазней — Стараж. Рыма. Культавая архітэктура гэтага часу сумяшчае ант. і стараж.-егіп. формы, мае рысы эклектызму (храм бога Гора ў Эдфу, 237—57 да н.э.). Сплаў стараж.-егіп. і рым. традыцый — *фаюмскія партрэты*. З пераходам Е. пад уладу Візантыі (канец 4 ст. да н.э.) склаўся адзін з мясц. варыянтаў раннехрысціянскай культуры — *копцкае мастацтва*.

Музыка. Асн. крыніцы звестак пра музыку Стараж. Е. канца 4 — пач. 3-га тыс. да н.э. — інструменты, іканаграфічныя матэрыялы (барэльефы і інш. выявы), тэксты гімнаў і песнапенняў, сведчанні стараж.-грэч. і рым. гісторыкаў, філосафаў. З інструментаў вядомы бразготкі, у т.л. сістры, калатушкі, свісткі, флейты. У 3000 — каля 1700 да н.э. існавалі трысняговыя свірэлі, падоўжаныя флейты уфата, трубы, дугавыя арфы, барабаны, трашчоткі. Ладавая аснова, верагодна, *пентатоніка*. У перыяд Стараж. і Сярэдняга царстваў узнікла піктаграфічная (малюнкавая) натацыя і першыя працы па касмалагічнай тэорыі сувязі музыкі з нябеснымі свяціламі. Музыка суправаджала прыдворныя і храмавыя рытуалы, была адным са сродкаў развясельвання розных слаёў насельніцтва. Асаблівае значэнне мела храмавая музыка, звязаная найперш з культам багоў Асірыса, Ісіды і Тота, якіх лічылі творцамі муз. мастацтва. Было пашырана музіцыраванне пры дварах, у багатых гараджан і нар. творчасць (пераважна відовішчы, прысвечаныя багам, дзе хар. песні, жаночыя песні-плачы і танцы чаргаваліся з шэсцямі і драм. эпізодамі). У 3-м тыс. да н.э. па-

Да арт. **Егіпет** Старажытны. Залатая маска фараона Тутанхамона. 14 ст. да н.э.

шырылася хейраномія (адна з ранніх форм кіравання хорам). У эпоху Стараж. царства паявіліся прафес. (звычайна прыдворныя) музыканты (Хемрэ, Хуфу-Анх і інш.). У перыяд Новага царства ўзмацніліся азіяцкія ўплывы, асабліва сірыйскі. Муз. інструментарый узбагаціўся габоямі, вуглавымі арфамі, лірамі, лютнямі, кіфарамі і інш., больш дасканалая канструкцыя якіх прывяла да выкарыстання практычна поўнага храматычнага гукарада. У 332 да н.э. — 395 н.э. шырока бытавалі аўлас, папярочная флейта, букцыны, розныя ліры, губны гармонік, барабаны, званочкі і інш., у 3 ст. да н.э. ў Александрыі вынайдзены папярэднік сучаснага аргана — гідраўлас. Некат. егіпецкія музыканты працавалі ў Грэцыі і Рыме, а грэч. музыканты — у Е., што спрыяла развіццю муз. мастацтва гэтых краін.

Літ.: Струве В.В. История Древнего Востока. 2 изд. Л., 1941; Бикерман Э. Хронология Древнего мира: Пер. с англ. М., 1975; Стучевский И.А. Рамсес II и Херихор: Из истории Древнего Египта эпохи Рамессидов. М., 1984; Котрелл Л. Во времена фараонов: Пер. с англ. М., 1982; Монтэ П. Египет Рамсесов: Пер. с фр. М.,

1989; Жак К. Египет великих фараонов: Пер. с фр. М., 1992; Шмелев И.П. Феномен Древнего Египта. Мн., 1993; Hornung E. Grundzüge der ägyptischen Geschichte. Darmstadt, 1978; Bowman A.K. Egypt after the Pharaohs. 332 B.C. — A.D. 642. London, 1986; Grimal N. Histoire de l'Égypte Ancienne. Paris, 1988; Лукас А. Материалы и ремесленные производства Древнего Египта: Пер. с англ. М., 1958; Кинк Х.А. Как строились египетские пирамиды. М., 1967; Лауэр Ж.Р. Загадки египетских пирамид: Пер. с фр. М., 1966; Нейгебауер О. Точные науки в древности: Пер. с англ. М., 1968; Матье М. Древнеегипетские мифы. М.; Л., 1956; Коростовцев М.А. Религия Древнего Египта. М., 1976; Липинская Я., Марциняк М. Мифология Древнего Египта: Пер. с пол. М., 1983; Kákosy L. Zauberei im alten Ägypten. Budapest, 1989; Dunand F., Zivie-Coche Ch. Dieux et hommes en Égypte 3000 av. J.-C. — 395 apr. J.-C. Paris, 1991; Traunecker C. Les dieux de l'Égipte. Paris, 1992; Niwiński A. Mity i symbole starożytnego Egiptu. Warszawa, 1992; Яго ж. Bóstwa, kulty i rytuały starożytnego Egiptu. Warszawa, 1993; Фараон Хуфу и чародеи: Сказки, повести, поучения Древнего Египта. М., 1958; Коростовцев М.А. Путешествие Ун-Амуна в Библ. М., 1960; Лирика Древнего Египта: [Пер. с егип.] М., 1965; Поэзия и проза Древнего Востока. М., 1973; Повесть Петеисе III: Древнеегип. проза. М., 1978; Сказки и повести Древнего Египта. Л., 1979; Лирическая поэзия Древнего Востока. М., 1984; Тураев Б.А. Египетская литература. Т. 1. М., 1920; История всемирной литературы. Т. 1. М., 1983; Культура Древнего Египта. М., 1976; Матье М.Э. Искусство Древнего Египта. М., 1970; Павлов В.В., Ходжаш С.И. Художественное ремесло Древнего Египта. М., 1959; Всеобщая история архитектуры. Т. 1. М., 1970.

Дз.І.Малюгін (гісторыя), *Н.К.Мазоўка* (асвета, міфалогія і рэлігія, літаратура).

ЕГІПЕТ (араб. Міср), Арабская Рэспубліка Егіпет (Гумхурыя Міср аль-Арабія), дзяржава на ПнУ Афрыкі і на Сінайскім п-ве ў Азіі. Мяжуе з Лівіяй на З, з Суданам на Пд, з Ізраілем і сектарам Газа на ПнУ. Абмываецца Міжземным м. на Пн, Чырвоным м. на У. Падзяляецца на 26 мухафаз (губернатарстваў). Пл. 1001,4 тыс. км². Нас. 64,8 млн. чал. (1997). Сталіца — г. *Каір*. Афіц. мова — арабская. Дзярж. рэлігія — іслам суніцкага толку. Нац. свята — Дзень Рэвалюцыі (23 ліп.).

Дзяржаўны лад. Е. — дэмакр. рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1971 (са зменамі 1980). Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца насельніцтвам тэрмінам на 6 гадоў (пры прэзідэнце дзейнічае дарадчая Прэзідэнцкая рада). Вышэйшы заканад. орган — аднапалатны. Нар. сход, які складаецца з 458 дэпутатаў (10 з іх назначае прэзідэнт, астатнія выбіраюцца насельніцтвам, усе тэрмінам на 5 гадоў). Выканаўчая ўлада належыць кабінету міністраў на чале з прэм'ер-міністрам (дарадчы орган пры ўрадзе — Кансультатыўная рада з 258 чал.).

Прырода. Амаль уся краіна знаходзіцца ў межах *Сахары*. У рэльефе пераважае плато з выш. 300—1000 м, якое падзяляецца па фіз.-геагр. асаблівасцях на плато *Лівійскай пустыні* на З, плато *Нубійскай пустыні* на ПдУ і плато *Аравійскай пустыні* на У. Лівійская пустыня займае $^2/_3$ пл. краіны, складзена з пясчанікаў і вапнякоў, якія падвяргаюцца ветравой эрозіі. Месцамі дзюны і барханы выш. да 300 м. На Пн упадзіна Каттара, якая ляжыць на 133 м ніжэй узроўню мора. Аравійская і Нубійская пустыні больш камяністыя, павышаюцца ў бок Чырвонага мора, дзе месцамі маюць выгляд гор (да 2187 м). На Пд Сінайскага п-ва горы з найвыш. пунктам Е. (г. Катэрын, 2637 м), на Пн — плато і раўніна. Вельмі важнае значэнне мае даліна р. Ніл (даўж. ў Е. 1200 км, шыр. 1—3 км на Пд, 20—25 км ка-

Герб і сцяг **Егіпта**.

ля Каіра, пл. разам з дэльтай каля 40 тыс. км^2). У пустынях ёсць невял. аазісы. Карысныя выкапні: нафта (узбярэжжа і акваторыя Суэцкага зал., ПнЗ), прыродны газ (на ПнЗ), жал. руда (раён Эль-Кусейра і аазіс Бахарыя), фасфарыты (аазіс Харга, Эль-Кусейр). Ёсць каменная соль, каменны і буры вугаль, марганец, золата, волава, вальфрам, малібдэн, тантал і інш. Клімат гарачы і вельмі сухі, на большай ч. трапічны кантынентальны. На ўзбярэжжы Міжземнага м. і ў дэльце р. Ніл клімат субтрапічны — сярэдняя т-ра студз. 11 °С, ліп. 29 °С, ападкаў 250—300 мм за год. На Пд сярэдняя т-ра студз. 16 °С, ліп. 34 °С, ападкаў некалькі мм за год. Адзінай ракой з'яўляецца Ніл. На ім вадасховішча — воз. Насэр (пл. 5120 км^2). Ніл мае асаблівае значэнне для арашэння, як крыніца водазабеспячэння і гідраэнергіі, як трансп. шлях. Ад яго адыходзяць арашальныя каналы, якія выкарыстоўваюцца і для суднаходства. Міжнар. значэнне мае *Суэцкі канал*. На тэр. Е. рэзка выдзяляюцца 2 ландшафты: дэльта і даліна Ніла з урадлівымі алювіяльнымі глебамі і багатай культ. раслінасцю; пясчаныя або камяністыя пустыні з вельмі беднай разрэджанай раслінасцю. Рэзерват Вадзі-Рышраш, некалькі заказнікаў.

Насельніцтва. 98% насельніцтва — арабы (егіпцяне). Жывуць таксама нубійцы (на Пд), берберы (аазіс Сіва), грэкі і армяне (у вял. гарадах) і інш. Пераважная большасць егіпцян мусульмане, каля 3 млн. хрысціян-коптаў (жывуць пераважна ў гарадах). Ёсць невял. групы католікаў, пратэстантаў і інш. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва 65 чал. на 1 км^2. Амаль усё яно засяроджана ў даліне і дэльце Ніла, дзе шчыльнасць дасягае 1000—2000 чал. на 1 км^2. Шчыльна заселены таксама ўзбярэжжа Суэцкага канала і аазісы. У пустынях каля 70 тыс. качэўнікаў. У гарадах жыве 53% насельніцтва. Найб. гарады (тыс. ж., 1992): Каір — 6800, Александрыя — 3380, Гіза — 2144, Шыбін-эль-Ком — 834, Порт-Саід — 460, Эль-Махала-эль-Кубра — 408, Суэц — 388, Танта — 380, Эль-Мансура — 371, Асьют — 321. Каля 3 млн. егіпцян працуюць за мяжой, пераважна ў Лівіі (1 млн. чал.) і краінах Персідскага заліва.

Гісторыя. У старажытнасці на сучаснай тэр. Е. ўзнік адзін з першых цэнтраў цывілізацыі. Тысячагоддзямі тут існавала рабаўладальніцкая дзяржава — *Егіпет* Старажытны. У 31—395 уваходзіў у склад Рым. імперыі, пасля распаду якой стаў правінцыяй яе ўсх. ч. — *Візантыі*. У рым. перыяд адбыўся заняпад стараж.-егіп. культуры; познаегіп. мова змянялася копцкай, мясц. рэлігія — хрысціянствам. Візантыйцы ў кіраванні Е. абапіраліся на сілу і рэпрэсіі, што аблегчыла завяванне яго арабамі-мусульманамі. У 642 захоплена сталіца Е. — Александрыя, краіна стала правінцыяй Араб. халіфата. У выніку араб. завявання егіп. насельніцтва паступова перайшло на араб. мову, копцкую рэлігію выцесніў ісламскі Е. стаў правінцыяй ісламскай імперыі. Напачатку ім правілі *Амеяды*, з 750 — *Абасіды*. З аслабленнем *Абасідаў халіфата* Е. фактычна кіравалі незалежна ад багдадскіх халіфаў *Тулуніды* і Іхшыдыды (935—969). У 969 Е. завяваны войскамі *Фатымідаў*, якія пабудавалі тут горад «Аль-Каһіра» (перамаганосны) — Каір, які з 973 стаў іх сталіцай. З сярэдзіны 11 ст. пачаўся распад *Фатымідаў халіфата*, што выкарысталі еўрап. крыжаносцы. У 1168 яны ўварваліся ў Е. і аблажылі Каір. Халіф звярнуўся за дапамогай да Сірыі. У барацьбе з крыжаносцамі вызначыўся палкаводзец *Салах-ад-дзін* (Саладзін). У 1171 ён скінуў фатымідскага правіцеля, стварыў незалежную дзяржаву і стаў яе султанам. Праўленне заснаванай ім дынастыі *Айюбідаў* адзначана адраджэннем Е., уздымам сельскай гаспадаркі і культуры. Пры іх устаўлявалася ваенна-ленная сістэма, створана гвардыя *мамлюкаў*, якая ў 1250 захапіла вярх. ўладу. Найбольшым поспехам мамлюкаў быў разгром мангольскага войска ў Палесціне ў 1260, у час якога вызначыўся военачальнік Бейбарс. У хуткім часе ён стаў султанам Е. і ўзначаліў выгнанне крыжаносцаў з прыбярэжных крэпасцей Палесціны, Лівана, Сірыі (завершана ў канцы 13 ст.). Мамлюцкія правіцелі стварылі магутную дзяржаву, якая акрамя Е. ўключала Сірыю, Кілікію, Чырванаморскае ўзбярэжжа Судана і інш. У 13—14 ст. Е. — эканамічна моцная дзяржава, адзін з буйнейшых рэліг. і культ. цэнтраў мусульм. свету, важны цэнтр гандлю паміж Афрыкай, Азіяй і Еўропай. У 1517 мамлюкаў перамаглі туркі-асманы і Е. стаў правінцыяй *Асманскай імперыі*. Гэта стала прычынай заняпаду культуры і гасп. жыцця Е., змяншэння колькасці яго насельніцтва. У 18 ст. ўплыў мамлюкаў зноў павялічыўся. Яны стварылі напаўнезалежны эмірат (бейлікат). Тур. султан перастаў быць рэальным кіраўніком Е., хоць і заставаўся яго рэліг.-паліт. сюзерэнам. У 1770 мамлюцкі эмір Алі-бей аль-Кабір абвясціў незалежнасць Е. З гэтага часу Е. стаў аб'ектам англа-франц. саперніцтва. У 1798 франц. войскі на чале з ген. Напалеонам Банапартам высадзіліся ў Александрыі. У бітве каля пірамід яны разбілі мамлюкскую армію і занялі Каір (гл. *Егіпецкая экспедыцыя 1798—1801*). У 1801 французы капітулявалі перад англа-тур. войскамі і Е. зноў прызнаны ўладаннем Асманскай імперыі. У 1805 нам. султана ў Е. з тытулам пашы стаў *Мухамед Алі*. Ён умацаваў сваю ўладу, расправіўся з непакорнымі мамлюкамі і шляхам рэформ распачаў мадэрнізацыю краіны. Яго магутная армія пачала захопніцкія войны з мэтай стварэння велізарнай арабскай імперыі. Гэта супярэчыла інтарэсам Вялікабрытаніі, Прусіі, Аўстрыі і Расіі, якія ўмяшаліся ў канфлікт на баку туркаў. У 1841 Е. капітуляваў і з гэтага часу пачаў ператварацца ў залежную ад еўрапейцаў краіну.

З 1840-х г. у Е. актыўна пранікаў замежны капітал, пераважна англійскі. У 1869 адкрыты *Суэцкі канал*, але яго выгоды выкарыстоўвалі найперш еўрапейцы, якія валодалі кантрольным пакетам акцый. Пры егіп. правіцелю Ісмаіле-пашы [1863—79], у краіне будавалі чыгункі, каналы, тэлегр. лініі, школы, з'явіліся нац. газеты і часопісы. Усё гэта прывяло да вялікай запазычанасці Е. замежным крэдыторам. У 1876 Е. аб'явіў аб сваім банкруцтве і над краінай устаноўлены англа-франц. фін. кантроль. Закабаленне краіны замежным капіталам абвастрыла сац. супярэчнасці і выклікала паўстанне патрыятычна настроеных афіцэраў на чале з А.*Арабі-пашой*. Быў створаны егіп. нац. ўрад, прыняты праект канстытуцыі, падрыхтаваны законапраекты. Гэта занепакоіла Вялікабрытанію, якая пад выглядам абароны іншаземцаў увяла ў Е. свае войскі і ў вер. 1882 перамагла армію

Да арт. **Егіпет**. Руіны г. Порт-Саід пасля налёту англійскай ваеннай авіяцыі. 1956.

Арабі-пашы. Е. фактычна стаў калоніяй Вялікабрытаніі, хоць фармальна лічыўся часткай Асманскай імперыі. У канцы 19 ст. ў Е. ўзніклі патрыят. арг-цыі, якія

Да арт. **Егіпет**. М. Саід. Горад.

ставілі сваёй мэтай нац. незалежнасць краіны. Ідэйным кіраўніком і арганізатарам егіп. нац.-вызв. руху быў публіцыст і асветнік М.*Камільі*. 1-я сусв. вайна значна паўплывала на адносіны Е. з Вялікабрытаніяй, якая ў снеж. 1914 ліквідавала ўладу Асманскай імперыі над Е. і абвясціла яго сваім пратэктаратам. У ваен. дзеяннях супраць Турцыі англічане выкарыстоўвалі матэр. і людскія рэсурсы Е., што ўзмацняла антыбрыт. настроі. У 1918 у Е. створана бурж.-памешчыцкая партыя Вафд на чале з С.Заглулам, якая патрабавала незалежнасці ад Вялікабрытаніі. Антыкалан. трымку экстрэмісцкай арг-цыі «Браты-мусульмане», якая выступала за ўвядзенне ў краіне ісламскага праўлення. 15.10.1951 вафдзісцкі ўрад дэнансаваў англа-егіпецкі дагавор 1936, у выніку чаго ваен. прысутнасць англічан у Е. страціла «законную» падставу. У зоне Суэцкага канала пачалася партыз. барацьба супраць брыт. войск. 23.7.1952 тайная патрыят. арг-цыя «Свабодныя афіцэры» на чале з Г.А.*Насэрам* ажыццявіла дзярж. пераварот. У выніку каралеь Фарук адрокся ад прастола і быў высланы з краіны; усе паліт. партыі забаронены, прыняты аграрны закон, які абмяжоўваў буйное землеўладанне. 18.6.1953 Е. абвешчаны рэспублікай, прэзідэнтам краіны стаў ген. М.Нагіб,

Да арт. **Егіпет**. Танец «Сіва» ў выкананні ансамбля народнага танца «Рэда».

егіпецкія паўстанні 1919, 1921 прымусілі Вялікабрытанію пайсці на пэўныя ўступкі, і дэкларацыяй 28.2.1922 абвешчаны адмена пратэктарату і незалежнасць Е.; яго султан атрымаў тытул караля. Аднак брыт. войскі заставаліся ў краіне, захавалася і эканам. панаванне англічан. Прынятая ў 1923 канстытуцыя прадугледжвала некаторыя бурж.-дэмакр. правы і гарантавала прывілеі іншаземцам, а егіп. каралю давала шырокія паўнамоцтвы. Магутная хваля нац.-вызв. і забастовачнага руху прымусіла англічан падпісаць *англа-егіпецкі дагавор 1936* аб дружбе і саюзе і пацвердзіць незалежнасць Е. У 2-ю сусв. вайну тэр. Е. стала арэнай ваен. дзеянняў. Італія і Германія імкнуліся захапіць Суэцкі канал. У кастр. 1942 брыт. войскі спынілі ням. армію ген.-фельдмаршала Э.Раммеля і ў бітве пад Эль-Аламейнам нанеслі ёй паражэнне. Толькі ў люг. 1945 егіп. ўрад аб'явіў вайну краінам фаш. блока. Е. стаў чл.-заснавальнікам ААН, пры яго актыўным удзеле ў 1954 створана *Ліга арабскіх дзяржаў*. Пасля 2-й сусв. вайны егіп. ўрад сутыкнуўся з шэрагам сац.-эканам. праблем; нявырашаным заставалася і пытанне вываду брыт. войск. У 1948 Е. і інш. араб. краіны ўступілі ў вайну з Ізраілем і пацярпелі паражэнне (гл. *Араба-ізраільская вайна 1948—49*). Усеагульная незадаволенасць вынікамі вайны, каралеўскім рэжымам і брыт. прысутнасцю ў Е. вылілася ў падякі захаваў і пост прэм'ер-міністра. Новы ўрад дамогся падпісання *англа-егіпецкага пагаднення 1954*, паводле якога да 18.7.1956 з зоны Суэцкага канала выводзіліся ўсе брыт. войскі. У кастр. 1954 Нагіб змешчаны з усіх пасад. Прэзідэнтам Е. стаў Насэр, які ўзяў курс на супрацоўніцтва з СССР і інш. сацыяліст. краінамі. Стрыжнем яго эканам. палітыкі было буд-ва Асуанскай плаціны. Але ЗША і Вялікабрытанія, не задаволеныя курсам Насэра, адмовіліся крэдытаваць будаўніцтва канала. У адказ егіп. прэзідэнт 26.7.1956 аб'явіў аб нацыяналізацыі міжнар. кампаніі Суэцкага канала, што стала моцным ударам па пазіцыях Вялікабрытаніі і Францыі ў гэтым рэгіёне. У кастр. 1956 войскі Ізраіля, падтрыманыя Вялікабрытаніяй і Францыяй, уварваліся на Сінайскі п-аў. Англа-франц. войскі акупіравалі зону Суэцкага канала, захапілі Порт-Саід, бамбардзіравалі Александрыю. Толькі ўмяшанне СССР і ЗША прымусіла агрэсараў вывесці войскі з Е. Гэтыя падзеі павысілі прэстыж краіны і яе прэзідэнта, зрабілі яго лідэрам усяго араб. свету. У люг. 1958 Е. і Сірыя ўтварылі Аб'яднаную Арабскую Рэспубліку (ААР), да якой далучыўся і Йемен (саюз з ім ануляваны ў снеж. 1961). Сірыя пасля дзярж. пераварота ў вер. 1961 выйшла з ААР, але Е. захаваў афіц. назву — ААР. 1960-я г. характарызаваліся значнымі сац.-эканам. пераўтварэннямі: прыняты шэраг дэкрэтаў аб нацыяналізацыі прыватных, страхавых, буд. і інш. буйных кампаній, банкаў, прамысл. прадпрыемстваў, транспарту і інш. 30.6.1962 Нац. кангрэс нар. сіл зацвердзіў Нац. Хартыю — важны паліт. дакумент ААР, які абвясціў мэтай егіп. рэвалюцыі сацыялізм. Да 1965 дзярж. сектар эканомікі даваў больш за 80% усёй прамысл. прадукцыі. У 1968 пры дапамозе СССР Е. завяршыў буд-ва Асуанскай плаціны, што значна палепшыла ірыгацыйную сістэму Е., павысіла прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі. Прымаліся меры па ліквідацыі сац. няроўнасці, працягвалася агр. рэформа, расшыралася адукац. сістэма. Аднак напружанасць у адносінах араб. краін з Ізраілем прывяла да ізраільска-арабскай вайны 1967. Ваен. паражэнне Е., страта Сінайскага п-ва з багатымі радовішчамі нафты абвастрылі ўнутрыпаліт. крызіс. Пасля смерці Насэра (1970) прэзідэнтам стаў А.*Садат*. У 1971 ён аднавіў афіц. назву краіны — Арабская Рэспубліка Егіпет і, каб забяспечыць эканам. рост краіны і дамагчыся вяртання акупіраваных Ізраілем зямель, пераарыентаваўся на ЗША. Паспяховае наступленне егіп. войск у кастр. 1973 на пазіцыі Ізраіля на Суэцкім канале скончылася заключэннем выгаднага для Е. пагаднення. Гэта стала пачаткам сепаратных перагавораў Е. з Ізраілем пры падтрымцы ЗША (дамоўленасці 1974 пра раз'яднанне ўзбр. сіл на Сінаі, 1975 пра частковы вывад ізраільскіх войск з акупіраваных тэр. і інш.). У 1978 падпісаны *Кэмп-Дэвідскія пагадненні*; на аснове іх 26.3.1979 падпісаны мірны дагавор, паводле якога Ізраіль вярнуў Е. акупіраваныя тэрыторыі; у 1980 паміж Е. і Ізраілем устаноўлены дыпламат. адносіны. Ва ўнутр. палітыцы Садат трымаў курс на развіццё рынкавых адносін, заахвочванне прыватнай ініцыятывы і замежных інвестыцый. Яго дзеянні не мелі падтрымкі ні ў Е., ні за яго межамі; араб. краіны не прызналі дагавор Е. з Ізраілем, выключылі Е. з Лігі араб. краін. У кастр. 1981 Садат забіты групай экстрэмістаў. Пры новым прэзідэнце М.Х.*Мубараку* паступова палепшыліся адносіны з інш. араб. краінамі (у 1989 адноўлена членства Е. ў Лізе араб. дзяржаў) і СССР. Унутр. хваляванні, выкліканыя цяжкай эканам. сітуацыяй (перанасяленне, беспрацоўе), а таксама рост актыўнасці мусульм. фундаменталістаў паслужылі падставай для захавання надзвычайнага становішча, уведзенага пасля замаху на Садата. У знешняй палітыцы Е. паслядоўна імкнуўся да арганізацыі мірных шматбаковых араба-ізраільскіх перагавораў і вырашэння праблемы палесцінцаў шляхам надання ім аўтаноміі. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены ў люг. 1992.

Палітычныя партыі і прафсаюзы. Правячая Нац.-дэмакр. партыя, Сацыяліст. партыя працы, Партыя ліберальў, Нац.-прагрэс. (левая) партыя, Аль-Ума, Но-

вы Вафд і інш. Прафсаюзы аб'яднаны ў Егіпецкую федэрацыю прафсаюзаў.

Гаспадарка. Е. — аграрна-індустр. краіна, буйны пастаўшчык на сусветны рынак высакаякаснай доўгавалакністай бавоўны і вырабаў з яе. Нац. даход на 1 чал. каля 800 дол. ЗША за год. Асн. галіна — земляробства, якое грунтуецца на штучным арашэнні водамі Ніла. У валавым унутр. прадукце сельская гаспадарка і рыбалоўства даюць 18%, прам-сць — 22%, абслуговыя галіны — 60%. У сельскай гаспадарцы занята каля 35% эканамічна актыўнага насельніцтва, у прам-сці — каля 13%.

Сельская гаспадарка. Вялікая колькасць ціпла і магчымасць арашэння зямель дазваляюць збіраць па

Да арт. Егіпет. М.Мухтар. Дзяўчына з Шалаля.

3—4 ураджаі за год. Плошчы зямель, якія апрацоўваюцца, складаюць 2,7 млн. га (1993). Гал. збожжавыя культуры (млн. т, 1993): пшаніца — 4,6, рыс — 4,2, кукуруза — 4,3, сорга — 0,8. Добра развіта агародніцтва, асабліва вырошчванне (тыс. т, 1993) памідораў — 3000, цыбулі — 1700, бульбы — 1700, капусты — 329, бахчавых культур — каля 600, а таксама бабовых (гарох, боб, фасоля), алейных (сезам, арахіс). Развіта пладаводства, вырошчванне (тыс. т, 1993) фінікаў — 615, апельсінаў — 1800, лімонаў — 308, бананаў — 397, манга — 180, вінаграду — 600, алівак, фіг. З тэхн. культур найб. значэнне мае вырошчванне доўгавалакністай бавоўны, якая займае каля $^1/_3$ пасяўных плошчаў (дэльта і паўн. ч. даліны Ніла), валавы збор бавоўны-сырцу 550 тыс. т (1993). Вырошчваюць таксама (млн. т, 1993) цукр. трыснёг (на Пд) — 11,9, цукр. буракі — 0,8. З-за недахопу пашы жывёлагадоўля не атрымала значнага развіцця. Гадуюць (млн. галоў) буйн. рог. жывёлу — 3,2, буйвалаў — 3,5, авечак — 3,7, коз — 3, у пустынях вярблюдаў — 0,2. Птушкагадоўля, асабліва развядзенне курэй — 38 млн. (1993). Рыбалоўства ў Ніле, азёрах і морах — каля 200—300 тыс. т штогод. Здабыча каралаў, жэмчугу, губак. З галін прамысловасці найб. значэнне мае горназдабыўная. Аснову складае нафтагазавы сектар, які з'яўляецца гал. экспартнай галіной краіны. Нафта здабываецца з 1911, здабыча складае 45,6 млн. т (1991), больш за 90% яе прыпадае на ўзбярэжжа і акваторыю Суэцкага зал.; здабыча прыроднага газу — каля 5 млрд. м^3 (1992), пераважна ў раёне ўпадзіны Катара. Здабываецца таксама (млн. т, 1991) жал. руда — 1,1, фасфаты — 1,9, марганец, каменная соль, каменны вугаль, буд. матэрыялы і інш. Вытв-сць электраэнергіі 40,5 млрд. кВт·гадз (1991), у т.л. каля 20% дае Асуанская ГЭС. Буйныя ЦЭС у Шубрыэль-Хейме, Каіры, Александрыі, інш. вял. гарадах працуюць на нафце і газе. Сярод галін апрацоўчай прам-сці вядучае месца займае харчовая і харчасмакавая. Выпускаецца шырокі асартымент іх прадукцыі (1991): цукар (1,1 млн. т, гал. цэнтры Ком-Омба, Ідфу, Армант), тытунёвыя вырабы (Каір, Александрыя, Гіза, Эль-Фаюм), плодаагароднінныя кансервы, алей (Даманхур, Танта, Эль-Мансура, Бені-Суэйф), вытв-сць мукі (каля 3,4 млн. т штогод), піва, сіропаў, сокаў, глюкозы. Развіты таксама рысаачышчальная (Эль-Мансура, Дум'ят, Эль-Махала-эль-Кубра) і рыбакансервавая (Дум'ят) прам-сць. Другое месца займае лёгкая прам-сць, асабліва тэкст., якая працуе на мясц. сыравіне. Гал. цэнтры Каір, Александрыя, Эль-Махала-эль-Кубра і інш. Бавоўнаачышчальныя прадпрыемствы ў Танце, Эль-Мансуры, Дум'яце, Бені-Суэйфе, шоўкаткацкія ў Хелуане, воўнапрадзільныя ў Танце, Эль-Міньі, Эль-Фаюме. Шырока развіты гарбарна-абутковая (Александрыя, Каір, Дум'ят, Эль-Фаюм, Асьют), швейная і трыкатажная галіны. Вытв-сць дываноў у Даманхуры і Асьюце, саматужная вытв-сць нац. адзення ў Танце, маст. рамёствы ў Каіры, Бені-Суэйфе, Эль-Міньі. Трэцяе месца ў структуры прам-сці належыць хім. і нафтахім. прам-сці. Асн. цэнтры нафтаперапрацоўкі і нафтахіміі Александрыя, Суэц, Каір, Порт-Саід. Развіта вытв-сць мінер. угнаенняў (фасфарытных і азотных) у Каіры, Кафр-эз-Заяце, Суэцы, Асьюце, гумавая прам-сць і вытв-сць аўтапакрышак у Александрыі. Атрымліваюць таксама соду, кіслоты, пластмасы і інш. хім. прадукты. Металург. прам-сць прадстаўлена Хелуанскім металург. камбінатам поўнага цыкла, прадпрыемствамі ў Каіры, металург. з-дам па вытв-сці акатышаў у Александрыі, алюмініевым камбінатам у Наг-Хамады. Металаапр. прадпрыемствы ў Каіры і Ісмаіліі. Машынабудаванне развіта параўнальна слаба: ёсць невял. вытв-сць чыг. вагонаў, аўтобусаў, легкавых і грузавых аўтамабіляў, самалётаў (зборка з прывазных дэталей), электратэхн. абсталявання, тэле- і радыёапаратуры. Асн. цэнтры Хелуан, Каір, Александрыя. Цэнтры суднабудавання і суднарамонту Александрыя, Суэц, Порт-Саід. Развіты ваен. прам-сць, вытв-сць буд. матэрыялаў, асабліва цэменту (каля 18 млн. т штогод, Александрыя, Хелуан, Асьют), па экспарце якога Е. займае адно з вядучых месцаў у свеце. Каля паловы прамысл. прадукцыі краіны выпускаецца ў Каіры і Александрыі. Транспарт. Е. мае добра развітую сетку трансп. шляхоў у асноўным у даліне і дэльце Ніла, па ўзбярэжжы Міжземнага м. і ўздоўж Суэцкага канала. Даўж. чыгунак 8,6 тыс. км, з іх 4,4 тыс. шырокакалейных, аўтадарог 38 тыс. км, з іх 15 тыс. км асфальтаваных. Даўж. суднаходных шляхоў па Ніле, каналах і пратоках дэльты складае 4 тыс. км. Знешнія гандл. сувязі праз порты Александрыя, Порт-Саід, Суэц. Танаж

Да арт. **Егіпет**. А.Г. алъ-Газар. Жанчына-дэрвіш.

Да арт. **Егіпет**. Х. Фаўзі. Праца.

гандл. флоту каля 1 млн. т. Велізарнае трансп.-гандл. значэнне мае Суэцкі канал, праз які штогод праходзіць 16—20 тыс. суднаў з грузам каля 100 млн. т. Даход ад эксплуатацыі канала складае каля 2 млрд. дол. штогод. Е. мае адмоўны гандл. баланс. Штогадовы экспарт 5—6 млрд. дол. ЗША. Экспартуюцца нафта і прадукты яе перапрацоўкі, прадукцыя горназдабыўной прам-сці, цэмент, алюміній, бавоўна, фрукты і гародніна, некат. харч. прадукты і інш. Штогадовы імпарт каля 15 млрд. дол. ЗША. Імпартуюцца пераважна харч. і хім. прадукты, машыны і трансп. сродкі. Асн. гандл. партнёры: па экспарце — Італія (15%), ЗША (11%), Грэцыя (8%), Сінгапур (6%), Германія (5%); па імпарце — ЗША (22%), Германія (10%), Італія (9%), Францыя (8%), Японія (6%). Гандаль з Рэспублікай Беларусь нязначны, у асобныя гады дасягае 2—3 млн. долараў: імпартуюцца грузавыя аўтамабілі, трактары, металарэзныя станкі, экспартуюцца абутак і цытрусавыя. Вялікае значэнне для эканомікі Е. мае замежны турызм і адпачынак. Арганізаваны зімовы адпачынак на ўзбярэжжах мораў. Штогод краіну наведвае каля 3 млн. турыстаў, даход каля 3 млрд. долараў. Краіна атрымлівае міжнар. дапамогу, істотнае значэнне для фінансавага стану маюць грашовыя пераводы эмігрантаў. Грашовая адзінка — егіпецкі фунт.

Узброеныя сілы. Уключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы і нерэгулярныя ваенізаваныя фарміраванні. Рэгулярныя ўзбр. сілы налічваюць 436 тыс. чал. (1997) і складаюцца з сухап. войск (310 тыс. чал.), ВПС (110 тыс. чал. у пач. 1995, 551 баявы і вучэбна-баявы самалёт) і ВМС (20 тыс. чал. у пач. 1995, 48 баявых караблёў, у т.л. 8 падводных лодак, і 41 баявы катэр). Стратэг. сілы налічваюць 2,4 тыс. ракет рознага прызначэння. Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Тэрмін ваен. службы — 3 гады (ва ўсіх родах войск). Нерэгулярныя ваенізаваныя фарміраванні складаюцца з цэнтр. сіл бяспекі (300 тыс. чал.), нац. гвардыі (60 тыс. чал.), пагран. корпуса (12 тыс. чал.), атрадаў «абароны і бяспекі» (60 тыс. чал.), берагавой гвардыі (7 тыс. чал.). Агульная колькасць рэзерву — 254 тыс. чал. (канец 1994).

Ахова здароўя. Мед. абслугоўванне бясплатнае. Нізкі ўзровень жыцця, клімат, дрэнныя сан. ўмовы і нерацыянальнае харчаванне — прычыны развіцця хвароб, што маюць эпідэмічны характар. Дзеці да двухгадовага ўзросту падлягаюць абавязковай вакцынацыі супраць воспы, дыфтэрыі, туберкулёзу, поліяміэліту. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 59,8, жанчын 63,8 года. Смяротнасць 9 на 1 тыс. чал. Забеспячэнне бальнічнымі ложкамі — 1 на 515 чал., урачамі — 1 тэрапеўт на 1472 чал. Узровень нараджальнасці — 28 на 1 тыс. чал. Натуральны прырост 1,9%. Дзіцячая смяротнасць 71 на 1 тыс. нованароджаных (1997).

Да арт. Егіпет. Г. Сірыі. Ніл каля вострава Замалек.

Асвета. У 1953—57 у Е. прыняты законы, якія заклалі асновы новай нац. сістэмы адукацыі. Сучасная сістэма адукацыі ўключае дзіцячыя сады (пераважна прыватныя) для дзяцей ва ўзросце 4—5 гадоў, абавязковыя пач., падрыхтоўчыя і старэйшыя школы, прафес. вучылішчы, сярэднія спец. навуч. ўстановы, ВНУ. Пач. школа 6-гадовая (ёсць прыватныя), у ёй вучацца дзеці ва ўзросце 6—12 гадоў. Падрыхтоўчая школа (тэрмін навучання 3 гады; дзеці 12—15 гадоў) дае няпоўную сяроднюю адукацыю; мае 2 кірункі — агульны і тэхнічны. Старэйшая школа (50% прыватных; тэрмін навучання 3 гады, навучэнцы ад 15 да 17 гадоў) дае поўную сяроднюю адукацыю. У 1-ы год навучання заняткі вядуцца па адзінай праграме; потым вучні размяркоўваюцца па прыродазнаўча-матэм. і гуманітарным аддзяленнях. Прафес. адукацыя (3 гады навучання) на базе падрыхтоўчай школы. У сістэме вышэйшай адукацыі 8 ун-таў, 14 спец. ВНУ, з іх 5 мастацкіх, у т.л. Акадэмія араб. музыкі (з 1932) у Каіры. Буйнейшыя ун-ты: Айн-Шамс (з 1950), мусульм. аль-Азхар (рэарганізаваны ў 1961) у Каіры, Александрыйскі (з 1942), ун-т у г. Танта і інш. Найб. б-кі: Нац. (з 1870) у Каіры, Александрыйская гарадская, б-кі Каірскага і Александрыйскага ун-таў. Найб. музеі: Егіп. нац. (з 1858), музеі ісламскага (з 1881) і сучаснага (з 1920) мастацтва, Геал. (з 1899), егіп. цывілізацыі (з 1939) — усе ў Каіры, грэка-рымскіх старажытнасцей (з 1892) і Марскі (з 1948) у Александрыі. Навук. даследаванні праводзяцца ў галіновых цэнтрах і лабараторыях адпаведных мін-ваў, НДІ, ва ун-тах і навук. ін-тах пры іх, у Нац. даследчым цэнтры (з 1956) пры н.-д. і тэхнал. Акадэміі. Дзейнічаюць Ін-т Егіпта (з 1798) у Каіры і Акадэмія араб. мовы (з 1932) у Гізе.

Друк, радыё, тэлебачанне. Друк Е. (усе перыяд. выданні) падпарадкаваны Найвышэйшай радзе прэсы. Цэнтр выдавецкай дзейнасці краіны — г. Каір. Найб. папулярныя і ўплывовыя выданні: штодзённыя газеты «Аль-Ахрам» («Піраміды», з 1876), «Аль-Ахбар» («Паведамленні», з 1952), «Аль-Гумхурыя» («Рэспубліка», з 1953). Гал. інфармацыйнае агенцтва — Блізкаўсходняе агенцтва навін (з 1955) — рыхтуе рэгулярныя паведамленні на араб., англ. і франц. мовах. Радыё (з 1928) і тэлебачанне (з 1960) падпарадкаваны Егіпецкай карпарацыі радыёвяшчання і тэлебачання. Радыё штодзённа мае 300 гадзін вяшчання на араб., англ., франц., арм., ням., грэч., італьян., яўр.´і розных афрыканскіх мовах, тэлебачанне — 22,5 гадз вяшчання па 3 каналах. У Е. дзейнічае Блізкаўсходняе радыёвяшчанне (з 1964), якое трансліруе камерцыйную праграму з Лондана.

Літаратура. Традыцыйна развівалася на *арабскай мове* ў цеснай сувязі з л-рамі Лівана, Сірыі і інш. арабскіх краін на аснове іх агульнай культ. спадчыны (гл. *Арабская культура*). Працэс абнаўлення літ. і культ. жыцця Е. ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. звязаны з дзейнасцю ранніх асветнікаў — заснавальніка Школы перакладу (1836) Р.Р. ат-Тахтаві, заснавальніка Нац. б-кі А.Мубарака, А.Факры і інш. У 1870—1919 вызначальны ўплыў на грамадскую думку і станаўленне новай егіп. л-ры зрабілі ідэолагі мусульм. рэфармацыі М.С.Джэмаль-ад-дзін аль-Афгані, М.Абда, прыхільнік эмансіпацыі жанчын К.Амін, заснавальнік нац. партыі «Ватан» М.Ка-

міль. Побач з публіцыстыкай развівалася звязаная з ёй ідэйна, але традыц. па форме паэзія М.С. аль-Барудзі, Я.Сану, Ісхака Адзіба, В.Йекуна, А.Шаукі і інш. У пошуках сродку прапаганды сваіх поглядаў егіп. асветнікі звярталіся да тэатра. Яго рэпертуар напачатку складаўся з перакладаў і апрацовак (звычайна з перанясеннем дзеяння ў Е.) драм У.Шэкспіра, П.Карнеля, Мальера, В.Гюго. У 1880-я г. арыгінальныя драмы стварылі А.Надзім («Бацькаўшчына» і «Арабы»), Каміль («Завяванне Андалусіі»). Пачынальнікам жанру гіст. рамана сталі ліванскія эмігранты Дж.Зейдан і Антун Фарах. У пач. 20 ст. з'явіліся асветніцкія аповесці Хафіза Ібраxіма, М. аль-Мувайліхі і інш. Важным этапам на шляху да рэаліст. прозы сталі аповесць «Зейнаб» М.Х.Хайкаля і зб. апавяданняў «Што вочы бачаць» заснавальніка школы егіп. навелістыкі Мухамеда Тэймура. З уздымам нац.-вызв. руху ў 1919—21 пачынаецца навейшы перыяд у гісторыі егіп. л-ры. Узніклі абноўленыя паэт. формы. У паэзіі ўсталяваўся рамантызм, прадстаўнікамі якога былі літ. групы «Паэты Дывана» (А.М. аль-Акад, А.Шукры і інш.), «Паэты Вадаспаду» (А.Хільмі) і «Апалон» (А.З. Абу Шадзі, І.Нагі, А.М.Таха), у прозе — рэалізм (апавяданні Махмуда Тэймура, аповесць «Дні» Хусейна Таха, навелы А.Х.Саіда, М.Т.Лашына і інш.). У драматургіі 1920—30-х г. побач з гістарычнымі паяўляюцца творы сучаснай тэматыкі (п'есы Т. аль-Хакіма, Мухамеда Тэймура, А.Язбека), у прозе развіваецца рамант. кірунак (раманы «Вяртанне духа» аль-Хакіма і «Ібрахім-журналіст» І. аль-Мазіні). У перыяд рэакцыі і спаду нац.-вызв. руху (1930-я г.) у л-ры сталі адчувальнымі песімістычныя настроі, матывы адчаю (сімвалісцкія драмы «Спячыя ў пячоры», «Шэхеразада» аль-Хакіма, аповесць «Кліч няведамага» Махмуда Тэймура, навелы Я.Хакі). Пасля перамогі нац.-вызв. рэвалюцыі 1952 вядучае месца ў л-ры занялі «новыя рэалісты», асн. тэма творчасці якіх жыццё і барацьба простых людзей (зб. апавяданняў А. аль-Хамісі, аповесць «Грэх» Ю.Ідрыса, раманы «Зямля», «Ускраінныя вуліцы» А. аш-Шаркауі). У раманах Н.Махфуза «Новы Каір», «Пачатак і канец», трылогіі «Бейн аль-Касрэйн» паказана шырокая панарама жыцця грамадства ў 1-й пал. 20 ст. Паэзія 1950-х г. прадстаўлена творчасцю аш-Шаркауі, С. Абд-ас-Сабура, А.Хігазі і інш. Расчараванне грамадства, асабліва пасля паражэння Е. ў вайне з Ізраілем у 1967, выклікала настроі адчаю і бязвер'я. Адыход ад сац. праблематыкі, замыканне ў рамках суб'ектыўных перажыванняў, матывы адчужэння характэрныя для навелістыкі М.Х.Рагаба, Д. аш-Шаркауі. Пошукі і эксперыменты ў галіне формы пашырылі маст. магчымасці прозы, узбагацілі яе ў жанравых адносінах. Рэаліст. проза 1970-х г. спалучала псіхалагізм з фальклорным вобразнасцю, дакументальнасць з прыёмамі гратэску (сатыр. раманы «Хроніка вуліцы аз-Заафарані» Г. аль-Гітані, дакумент. аповесць «Гэта адбываецца ў Егіпце ў нашы дні» М.Ю. аль-Куайіда).

Архітэктура. З прыходам арабаў (639) у архітэктуры Е. адбыўся ўздым, звязаны з утварэннем новай сталіцы Фустат (640) і інтэнсіўным культавым і свецкім буд-вам новага тыпу. Першыя араб. гарады мелі характар вайск. лагера: гал. элементамі арх. ансамбля сталі мячэці, палацы, грамадскія лазні і памяшканні для гарнізона. Прамавугольныя кампазіцыі гар. забудовы абносілі мурамі. Сярод найб. ранніх пабудоў — мячэць Амра ў Фустаце (641—642, перабудавана ў 9 ст.). Прыкладам сталай егіп. архітэктуры была мячэць Ібн Тулуна ў Каіры (876—879), якая адаптавала традыцыі *копцкага мастацтва* і пярэднеазіяцкага буд-ва: уключала 5-нефавую шматкалонную залу для малення, адкрытую ва ўнутр. квадратны ў плане двор, абкружаны арачнымі галерэямі. Ёй характэрны смеласць і прастата прасторавага вырашэння, веліч манум. аб'ёмаў. У перыяд Фатымідаў (10—12 ст.) Каір набыў абарончы выгляд, пабудаваны гар. муры і брамы з квадратнымі і паўкруглымі зубчастымі вежамі. У сакральнай архітэктуры з'явіліся Т-падобны трансепт, дэкар. распрацаванасць і акцэнтаванасць парталаў-уваходаў і мінарэтаў, што фланкіравалі будынкі т.зв. калоннага тыпу (мячэці аль-Азхар, 970—972; аль-Хакім, 990—1013). Раннефатымідскія маўзалеі былі квадратныя ў плане, з аркай у цэнтры кожнага фасада і купалам на 8-гранным барабане (група маўзалеяў Саб'а Банат у Фустаце). Больш познія часам мелі круглую камеру, якая абкружалася з трох бакоў галерэяй, і 3 міхрабы; у канструкцыі тромпаў і ветразяў з'явіліся сталактыты (маўзалей Ум Кульсум у Каіры, 1122). Пры Айюбідах (12—13 ст.) і Мамлюках (13—15 ст.) на змену квадратным у плане мячэцям прыйшлі складаныя арх. комплексы, якія звязвалі ў адзіны ансамбль залу для малення, медрэсэ, маўзалеі і інш. (комплексы султанаў Калауна, 1284—85, і Каіт-бея, 1472, у Каіры). Маўзалейная ч. пабудовы заўсёды мела высокі купал на барабане і фланкіравалася шмат'яруснымі мінарэтамі ў выглядзе шматгранных ці круглых вежаў з абходнымі балконамі і верхняй пляцоўкай-«ліхтаром» пад купалападобным завяршэннем. Строгасць манум. форм спалучалася з багаццем дэкору (мячэць-медрэсэ султана Хасана ў Каіры, 1356—63). У перыяд Асманскай імперыі (16—18 ст.) мячэці ўзводзіліся на ўзор турэцкіх: цэнтрычныя буйнамаштабныя пабудовы з вял. паўсферычнымі купаламі і мінарэтамі з вострымі завяршэннямі (мячэць Сінан-пашы ў Каіры, 1571). Архітэктура Е. сярэдзіны 19 — 1-й пал. 20 ст. звязана з еўрап. стылямі (мадэрн, канструктывізм і інш.): будынкі Егіп. нац. музея ў Каіры (1902, франц. арх. М.Дурньён), Вікторыя-каледжа (1950-я г., амер. арх. Дж.Полтак) і інш. З 1950-х г. развіваецца арх. забудова новых адм. і жылых раёнаў гарадоў (тэлевізійная вежа і будынак Лігі арабскіх краін).

Да арт. **Егіпет**. Будынак Лігі арабскіх краін.

Да арт. **Егіпет**. Каірская тэлевізійная вежа. 1950-я г.

нак Лігі араб. краін у Каіры). З'явілася нац. школа архітэктуры, якая распрацоўвае сучасныя праекты з улікам кліматычных асаблівасцей і мясц. традыцый горадабудаўніцтва (С.Карым, А.Сідкі, Н.Хебіб, М.Амар і інш.).

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Самыя раннія з вядомых узораў мастацтва мусульм. Е. адносяцца да фатымідскай эпохі: фрагменты фрэскі з лазні ў Фустаце (10—11 ст.), прыклады разьбы па камені, дрэве і слановай косці з фігуратыўнымі выявамі (фрызы з Фатымідскага палаца ў Каіры,

Да арт. **Егіпет**. М. Мухтар. Сялянка са збанам.

канец 10 — пач. 11 ст.), мініяцюры (малюнак тушшу з фігурамі двух воінаў, 11 ст.; ілюстрацыі да рукапісу «Макамат» аль-Харыры, 1337). У стылістыцы адчуваецца пераасэнсаванне копцкіх і эліністычных традыцый у новым ісламскім вобразе. У дэкар.-прыкладным мастацтве сярэдневяковага Е. асаблівае развіццё атрымалі тканіны з вышытым, тканым ці набіваным узорам; кераміка, размаляваная люстрам і каляровымі палівамі (9—12 ст.), посуд з горнага хрусталю (10—12 ст.), вырабы са шкла з размалёўкай каляровымі эмалямі (свяцільнікі для мячэцей, 13—15 ст.), бронзавыя фігуры («грыфон», 11—12 ст.). 13—15 ст. — росквіт разьбярства з геам. і расл. арнаментам (пераносныя міхрабы, падстаўкі для Карана і інш.). У вырабах 10—12 ст. у дэкоры часта выкарыстоўвалі выявы людзей і жывёл, пазней дамінавалі арабескі. Сучаснае выяўл. мастацтва Е. сфарміравалася ў канцы 19 ст. разам з нац.-вызв. рухам. Яго станаўленне звязана і з засваеннем еўрап. маст. культуры і са спробамі адраджэння стараж. нац. традыцый. Гэта тэндэнцыя характэрна для творчасці буйнейшага тагачаснага егіп. скульптара М.Мухтара (манумент «Абуджэнне Егіпта» ў Каіры, 1919—28). Жывапіс зазнаў уплывы імпрэсіянізму, фавізму, італьян. і франц. акадэмізму. Заснавальнікі сучаснага егіп. жывапісу А.Сабры, М.Нагі, М.Саід працавалі ў рэаліст. манеры. У 2-й пал. 20 ст. разам са спробамі авангардысцкага пераасэнсавання еўрап. мастацтва ў творчасці Г.Сіры, С.Абдэль Расула, Т.Хусейна, А.Г. аль-Газара, С.Рэды развіваецца тэматыка нар. жыцця. Пашырылася роля станковай і кніжнай графікі (Х.Фаўзі, А. аль-Вафі і інш.). Развіваюцца традыц. віды прыкладнога мастацтва: разьба па дрэве, метале, косці, ткацтва, кераміка і інш.

Музыка Е. вядома з глыбокай старажытнасці (гл. ў арт. *Егіпет* Старажытны). Да нашага часу захавалася выпрацаваная на працягу многіх стагоддзяў традыц. музыка. Яе асн. жанры — працоўныя, лірычныя, вясельныя, радзінныя, пахавальныя песні, танц. песні з воплескамі і характэрныя для Верхняга Е. элічныя песні-паданні. Мелодыка песень Ніжняга Е. заснавана на 7-ступенных гукарадах, на астатняй тэр. пераважае *пентатоніка*. Сярод муз. інструментаў: мізмар (тып лютні), аргуль (падвойны кларнет), флейты, барабаны дарабука або хока, табл баладзі (вял. барабан), рык (бубен), кусат (талеркі); з 7 ст. пашыраны араб. інструменты — уд, рэбаб, канун (стр. шчыпковыя), най (падоўжаная флейта). Сфарміравалася сістэма макамаў — макамат (пэўны прынцып музіцыравання і яго асобныя праявы). У эпоху сярэдневякоўя пашырыліся розныя віды свецкай араб. класічнай музыкі (захаваліся і цяпер): вак. жанры касыда, мувашшах, інстр. таксім і інш. У 18—19 ст. у муз. практыку ўвайшлі інстр. ансамблі тахт. Адным з найважнейшых муз. жанраў стаў дор (разгорнутая вак. кампазіцыя; выконвалася спеваком-мутрыбам, інстр. ансамблем і хар. групай). У 19 ст. ў музыку пачалі пранікаць элементы еўрап. муз. культуры, створаны муз. школы з еўрап. выкладчыкамі. У 1869 у Каіры адкрыўся першы на Афрыканскім кантыненце оперны т-р, дзе выступалі артысты з Еўропы (у 1871 тут пастаўлена опера Дж.Вердзі «Аіда», напісаная па заказу егіп. ўрада). Пачалі наладжвацца канцэрты, узніклі канцэртныя жанры. У 1910—20 склаўся жанр араб. аперэты (буйнейшы майстар С.Дэрвіш). У 1914 у Каіры заснаваны муз. клуб (з 1929 Ін-т арабскай музыкі), у 1927 — Муз. т-ва Е. У 1930-я г. паявіліся муз. кінафільмы, створаныя пры ўдзеле спевака, кампазітара, акцёра і рэжысёра М. Абд аль-Вахаба і спявачкі У.Кульсум. З 1930-х г. фарміруецца сістэма муз. адукацыі, у 1940—50-я г. прафес. кампазітарская школа (у 1955 засн. Саюз прафес. музыкантаў). Сярод кампазітараў А.Б.Хайрат, М.Р.Гарана, Г.А.Рахім і інш. Нац. муз. кадры рыхтуюць Каірская кансерваторыя (з 1959) і яе філіял у Александрыі, Ін-т араб. музыкі, Каірскі ін-т муз. выхавання і інш. Працуюць Каірскі оперны т-р, сімф. аркестр Каірскага радыё, аркестр араб. класічнай музыкі, Егіпецкая нац. трупа нар. мастацтва і інш.

Тэатр. Вытокі тэатра ў пахавальным рытуале з дыялогамі багоў, ролі якіх выконвалі жрацы, а таксама ў нар. святах у гонар багоў у суправаджэнні прадстаўленняў на міфалагічныя сюжэты. Падобныя прадстаўленні разыгрываліся ў эпоху Стараж. царства. У сярэднія вякі ў Е. існаваў ценявы т-р, вядомым дзеячам якога быў Ібн Даніял, пазней узнік лялечны т-р. У 19 ст. ў краіне гастраліравалі франц. і італьян. трупы. У 1869 Якуб Сану (псеўд. Абу Назара) стварыў першую нац. трупу і паставіў у Каіры сваю аперэту на араб. мове. У

Да арт. **Егіпет**. С. Рэда. Лялька.

1869 у Каіры пабудаваны т-р оперы. У 19 ст. з ліку інтэлігенцыі і вучнёўскай моладзі складаліся шматлікія аматарскія тэатр. калектывы. У канцы 19 — пач. 20 ст. працавалі прафес. трупы пад кіраўніцтвам Сану, С.Накаша, С. аль-Кардахі, Ісхака Адзіба і інш. (кожны з іх быў адначасова драматургам, рэжысёрам, акцёрам і, як правіла, уладальнікам трупы). Вял. значэнне для развіцця т-ра мелі пераклады твораў Мальера, У.Шэкспіра, П.Карнеля і інш. Т-р актыўна развіваўся ў 1910—20-я г.; ствараліся муз. і драм. трупы, ставіліся гіст. драмы. Папулярнасць набыла п'еса «Незвычайны госць» Т. аль-Хакіма (1918). У 1919 ён стварыў трупу, якая паспяхова працавала шмат гадоў. У 1930-я г. арганізаваны Вышэйшы к-т па развіцці араб. тэатр. мастацтва, у 1935 — першая дзярж. Нац. трупа. У 1944 засн. Арабскі ін-т т-ра. У 1950-я г. станаўленне нац. драматургіі садзейнічала арганізацыі дзярж. і прыватных трупп. У 1958 у Каіры адкрыты т-р лялек, у 1960-я г. ўзведзены тэатр. будын-

кі «Аль-Гумхурыя», «Аль-Эзбекія» і інш. Найб. вядомыя калектывы: Нац. т-р, Сусветны, «Масрах аль-Гейб», Таўфіка аль-Хакіма, камедыі. Сярод дзеячаў т-ра: А.Алям, Х.Рыяд, А.Фарыс, А.Гаміль і інш. У рэпертуары нац. і перакладная класічная драматургія. Другі тэатр. цэнтр Е. — г. Александрыя. Тэатры дзейнічаюць у гарадах Даманхур, Танта, Порт-Саід і інш. У Каіры функцыянуе Ін-т тэатр. мастацтва, створаны ў 1952 на аснове Араб. ін-та т-ра.

Кіно. З 1897 замежныя рэжысёры і аператары здымалі кароткаметражныя хранікальныя, з 1917 і ігравыя фільмы. У 1925 у Каіры пабудавана першая кінастудыя «Міср». З 1927 кінавытворчасць стала сістэматычнай. Асн. кінапрадукцыя 1930-х г. — муз. фільмы. У 1940-я г. экранізаваліся літ. творы і нац. легенды, з'явіліся фільмы на тагачасныя і гіст. сюжэты (рэжысёры А.Бадрхан, С. Абу Сейф, Х.Сідкі і інш.). У 1950-я г. ставіліся фільмы, прысвечаныя сац. і культ. пераўтварэнням, зменам у свядомасці людзей: «Джаміля», «Зямля», «Вярні мне жыццё» (у пракаце «Зноў жывы»), «Людзі на Ніле» (разам з СССР), «Мумія» і інш. Выпускаліся таксама меладрамы, камедыі, муз. фільмы. Кінематаграфія Е. набыла міжнар. вядомасць. У 1959 у Каіры адкрыты кінаінстытут. У пач. 1960-х г. кінавытворчасць Е. нацыяналізавана. Нягледзячы на крызісную сітуацыю ў кінематографе 1970—80-х г., прагрэс. дзеячы кіно працягвалі ствараць высокамаст. стужкі: «Народная лазня» (1972), «Ваданос мёртвы» (1977), «Бандыты» (1980), «Трубадур» (1981) і інш. Сярод акцёраў — Ф.Шаукі, Э.Хамзі, Н. аш-Шарыф, М.Малігі, актрыс — Шадзія, Ф.Хамама, Магда, С.Хусні, Н.Ібрахім, рэжысёраў — С.Іса, А.Фахмі. Працуюць кінастудыі «Міср», «Аль-Ахрам», «Ан-Ніл», «Галаль», «Насібіян».

Літ.: Беляев И.П., Примаков Е.М. Египет: время президента Насера. М., 1974; Князев А.Г. Египет после Насера, 1970—1981. М., 1986; Васильев А.М. Египет и египтяне. М., 1986; Голдобин А.М. Национально-освободительная борьба народа Египта, 1918—1936 гг. М., 1989; Кошелев В.С. Египет: уроки истории... (1879—1981). Мн., 1984; Яго ж. Египет от Ораби-паши до Саада Заглула, 1879—1924. М., 1992; al-Sayyid Marsot A.L. A Short History of Modern Egypt. Cambridge, 1993; Коцарев Н.К. Писатели Египта, XX в. М., 1975; Хавас Э.-С. М.А. Современная арабская народная песня: [Пер. с араб.] М., 1970; Еолян И.Р. Очерки арабской музыки. М., 1977.

П.І.Рогач (прырода, гаспадарка), *У.С.Кошалеў* (гісторыя, узброеныя сілы), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва).

ЕГІПЕЦКАЕ ПІСЬМО́, слоўна-складовая сістэма пісьма, якая абслугоўвала старажытнаегіпецкую мову (каля 4-га тыс. да н.э. — 3—4 ст. н.э.). Мела 3 разнавіднасці: іерагліфіка, іератыка і дэмотыка (гл. *Дэматычнае пісьмо*). Пачатковы этап Е.п. — малюнкавая ідэаграфія (гл. *Ідэаграфічнае пісьмо*), якая развілася з *піктаграфічнага пісьма*. Кожны малюнак абазначаў канкрэтны прадмет, з часам малюнкі сталі набываць пэўную сімволіку (напр., малюнак пчалы стаў абазначаць не толькі пчалу, а і занятак, стараннасць, працавітасць). Большасць *іерогліфаў* маглі мець гукавое значэнне: абазначалі спалучэнне 2 і больш зычных гукаў або асобны гук (усяго 24). Галосныя гукі ў іерагліфічным Е.п. не абазначаліся. Фанаграмы ў ім пераважалі над ідэаграмамі. Іерогліфаў, што найчасцей ужываліся, было каля 700. Выкарыстанне папірусу і трысняговай палачкі выклікала выпрацоўку курсіву — іератыкі, якая з'яўлялася спрашчэннем іерагліфікі. Абедзве разнавіднасці ўжываліся паралельна каля 3000 гадоў. Іератыкай пісаліся літ., навук. творы, дзелавыя паперы і інш. У 8 ст. да н.э. з іератыкі развіўся новы курсіў — дэмотыка, якая характарызуецца наяўнасцю большай колькасці лігатур і большай курсіўнасцю. Е.п. ўпершыню (1822) дэшыфраваў франц. вучоны Ж.Ф.*Шампальён*.

Да арт. **Егіпет**. Тэатр лялек у Каіры (сцэна са спектакля).



Да арт. **Егіпецкае пісьмо**. Узор іератычнага пісьма (зверху); той жа тэкст у іерагліфічнай перадачы.

Літ.: Павленко Н.А. История письма. 2 изд. Мн., 1987. *М.А.Паўленка.*

ЕГІ́ПЕЦКАЯ МО́ВА, асобная галіна *семіта-хаміцкіх моў* (разам з *копцкай мовай*). З 5 ст. — мёртвая. Была пашырана на тэр. сучаснага Егіпта, выцеснена егіпецкім дыялектам *арабскай мовы*. Падзяляецца на стараж.-егіпецкую (32—22 ст. да н.э.), сярэднеегіпецкую і класічную (22—14 ст. да н.э.), новаегіпецкую (14—7 ст. да н.э.), дэматычную (7 ст. да н.э. — 5 ст. н.э.). Усе звесткі пра Е.м. прыблізныя, што тлумачыцца складанасцю пісьма.

У фанетыцы вядомы зычныя і галосныя (на пісьме не абазначаліся) гукі. Націск — на апошнім ці перадапошнім складзе. У марфалогіі назоўнік меў мужч. і жан. род, адз., парны і мн. лік; склоны выражаліся аналітычна. Прыметнікі падзяляліся на якасныя і адносныя (нісбі), лічэбнікі — на колькасныя і парадкавыя. Дзеясловы мелі незалежны і залежны стан, загадны і неазначальны лад; катэгорыя часу ў ранні перыяд Е.м. адсутнічала. У сінтаксісе асновай класіфікацыі сказаў быў выказнік; адрозніваліся дзеяслоўныя і недзеяслоўныя сказы. Першыя пісьмовыя помнікі, напісаныя *егіпецкім пісьмом*, датуюцца канцом 4 — пач. 3-га тыс. да н.э.

ЕГІ́ПЕЦКАЯ ЭКСПЕДЫ́ЦЫЯ 1798—1801, паход франц. арміі ў Егіпет напярэдадні і ў час *напалеонаўскіх войнаў*. Была вынікам экспансіі Францыі на Б. Усход і яе барацьбы з Англіяй за сусв. панаванне. 19.5.1798 франц. войскі (30—38 тыс. чал.) пад камандаваннем ген. Напалеона Банапарта адплылі з Тулона і 1.7.1798 высадзіліся каля г. Александрыя (на шляху ў Егіпет да франц. уладанняў быў далучаны в-аў Мальта). Разбіўшы гал. сілы *мамлюкаў* у бітве каля пірамід (21.7.1798), Банапарт падпарадкаваў б.ч. Егіпта. У 1799 армія Банапарта ўварвалася ў Сірыю, аднак, страціла там $^1/_3$ асабовага складу і адступіла ў Егіпет. Пасля высадкі ў Егіпце англічан у 1801 франц. войскі капітулявалі і выведзены з Егіпта. Паводле *Ам'енскага мірнага дагавора* 1802 з Англіяй Францыя адмовілася ад прэтэнзій на Егіпет. У складзе экспедыцыі была група франц. вучоных, якая вывучала помнікі егіп. гісторыі і культуры, падрыхтавала і выдала іх апісанне.

ЕГІ́ПЕЦКІ НАЦЫЯНА́ЛЬНЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1858 у Каіры франц. егіптолагам А.Марыетам. Да 1891 наз. Булакскі музей, у 1891—1900 Гізехскі, з 1900 сучасная назва. Адзін з гал. цэнтраў вывучэння стараж.-егіп. мастацтва. Найбуйнейшы збор помнікаў мастацтва і культуры *Егіпта* Старажытнага; сярод іх знаходкі з руін г. Ахетатон і грабніцы фараона Тутанхамона, статуі фараонаў

Хефрэна, Аменемхета III, царэвіча Каапера і інш. Арганізуе археал. раскопкі. З канца 19 ст. выдае серыю каталогаў розных раздзелаў калекцыі.

ЕГІПЕЦКІЯ ПАЎСТА́ННІ 1919, 1921, нацыянальна-вызв. паўстанні супраць англ. калан. панавання ў Егіпце. Зімой 1918 партыя «Егіпецкая дэлегацыя» (Вафд) сабрала подпісы з патрабаваннямі прадаставіць Егіпту незалежнасць. У адказ 8.3.1919 англічане арыштавалі лідэра партыі С.Заглулу, што стала штуршком да паўстання. 9 сак. ў Каіры прайшла масавая дэманстрацыя пад лозунгамі поўнай нац. незалежнасці, адмены пратэктарату і вываду англ. войск. Кровапралітныя баі адбыліся ў Каіры, Александрыі, Порт-Саідзе і інш. гарадах, паўстанцы вызвалілі значную ч. тэр., стварылі свае органы ўлады. На кароткі час калан. ўлады страцілі кантроль, але кіраўніцтва Вафд не скарыстала момант для арганізацыі нар. мас, і англ. войскі задушылі паўстанне. У снеж. 1921 пасля спробы Англіі навязаць Егіпту нераўнапраўны саюзны дагавор пачаўся новы ўздым вызв. руху. Арышт лідэраў Вафд стаў сігналам да новага паўстання, якое было задушана ў пач. 1922. У лют. 1922 Вялікабрытанія адмовілася ад пратэктарату над Егіптам і фармальна прызнала яго незалежнасць. *У.С.Кошалеў.*

ЕГІПТАЛО́ГІЯ, комплексная навука, якая вывучае мову, гісторыю, культуру Стараж. Егіпта. Інтэнсіўнае развіццё Е. як навукі звязана з *Егіпецкай экспедыцыяй 1798—1801,* у якой удзельнічала каля 150 вучоных. У выніку іх дзейнасці заснаваны Ін-т Егіпта ў Каіры (дзейнічае і цяпер), выдадзена «Апісанне Егіпта» (т. 1—24, 1809—28). Дэшыфроўка ў 1822 Ж.Ф.Шампальёнам егіп.-іерагліфічнага пісьма на т.зв. Разецкім камені паклала пачатак навук. вывучэнню стараж.-егіп. помнікаў. У 1828—29 (Шампальён, І.Раселіні) і ў 1842—45 (К.Р.Лепсіус) праведзена інвентарызацыя помнікаў егіп. архітэктуры і мастацтва. Франц. егіптолагі вялі археал. раскопкі (А.Марыет), публікавалі помнікі егіп. філалогіі, перакладалі і выдавалі іерагліфічныя і іератычныя тэксты (Г.Масперо, Ф.Шаба, Э. дэ Ружэ, Э.Навіль), даследавалі гісторыю Стараж. Егіпта (Э.Дрыятон, Ж.Вандзье і інш.), яго рэліг. і сац. ін-ты (А.Марэ, Э.Ф.Гацье). Вялікае значэнне для развіцця Е. мела т.зв. берлінская школа, заснаваная ў 1890-я г. А.Эрманам. Ням. егіптолагі вывучалі пераважна егіп. мовы. Лепсіус выдаў збор першакрыніц, стварыў асновы храналагічнай перыядызацыі гісторыі Стараж. Егіпта. У 1880 выйшла граматыка копцкай (Л.Штэрн) і новаегіп. (Эрман) моў. Лексікаграфічныя даследаванні вёў Г.Бругш (іерагліфічна-дэматычны слоўнік). У 1896 пад кіраўніцтвам Эрмана і Г.Грапава пачалася праца над слоўнікам егіп. мовы. У пач. 20 ст. егіп. палеаграфію даследаваў Г.Мёлер, рэліг. тэксты — К.Зетэ і С.Шот, інш. літ. помнікі — Г.Штайндорф, гісторыю Стараж. Егіпта — Э.Маер, А.Шарф. Брыт. егіптолагі праводзілі інтэнсіўныя археал. раскопкі (У.Пітры Фліндэрс). У сярэдзіне 19 ст. выдадзены адзін з першых іерагліфічных слоўнікаў (С.Бёрч, 1867), апрацавана граматыка класічнай мовы (А.Гардынер), выдадзены копцкі слоўнік (У.Крам, 1939). Намаганнямі Дж.Брыстыда ў Чыкага (ЗША) заснаваны Усходні ін-т, вакол якога групаваліся амер. егіптолагі. Заснавальнік Е. ў Расіі У.С.Галянішчаў сабраў вял. калекцыю стараж.-егіп. матэрыялаў, апублікаваў працы па егіп. філалогіі і археалогіі. Аўтар «Гісторыі Старажытнага Усходу» (т. 1—2, 1935—36). Б.А.Тураеў стварыў рус. школу егіптолагаў. Сац.-эканам. развіццё стараж.-егіп. грамадства даследаваў В.В.Струве. Над праблемамі Е. працавалі У.І.Аўдзіеў, І.М.Лур'е, Ю.Я.Перапёлкін і інш. З 1952 пытанні Е. больш актыўна даследуюць самі егіпцяне. У сувязі з буд-вам Асуанскай плаціны для выратавання гіст. помнікаў, якія знаходзіліся ў зоне затаплення, у 1960 пры ЮНЕСКА быў створаны міжнар. к-т, у Егіпет і Судан накіраваны археал. экспедыцыі шэрагу краін. У Александрыі, Малаві, Асуане і інш. гарадах створаны музеі егіп. старажытнасцей. У 1976 у Каіры адбыўся 1-ы Міжнар. кангрэс егіптолагаў (з гэтага часу склікаецца кожныя 3 гады).

Літ.: Постовская Н.М. Изучение древней истории Ближнего Востока в Советском Союзе (1917—1959 гг.). М., 1961.

У.С.Кошалеў, Н.К.Мазоўка.

ЕГІЯЗАРА́Н Рыгор Егіязаравіч (21.12.1908, с. Блур Сурмалінскага пав., цяпер Турцыя — 4.11.1988), армянскі кампазітар, педагог. Нар. арт. Арменіі (1961), нар. арт. СССР (1977). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1935, клас М.*Мяскоўскага*). З 1938 выкладаў у Ерэванскай кансерваторыі (з 1959 праф., у 1954—60 рэктар). У 1952—56 старшыня Саюза кампазітараў Арменіі. Сярод твораў: балеты «Севан» (1956), «Возера мрояў» (1968), «Ара Прыгожы і Семіраміда» (1972); для сімф. аркестра — сімфонія «Раздан» (1960), «Рапсодыя» (1939), паэма «Арменія» (1942), сімф. карціна «Да ўзыходу сонца» (1952); канцэрт для скрыпкі з арк. (1943); хары, рамансы, песні, музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Сярод вучняў Э.*Аганесян.* Дзярж. прэмія Арменіі 1970.

ЕГІЯЗА́РАЎ Юрый Рыгоравіч (н. 22.5.1933, Баку), бел. вучоны ў галіне нафтахіміі. Д-р тэхн. н. (1984), праф. (1989). Скончыў Азерб. індустр. ін-т (1956). З 1962 у Ін-це фізіка-арган. хіміі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па вывучэнні хім. складу і тэхнал. уласцівасцей бел. нафты, каталітычных сістэм для перапрацоўкі вуглевадародnай сыравіны. Распрацаваў комплексную схему рацыянальнай перапрацоўкі нафты бел. радовішчаў, каталітычныя сістэмы для вытв-сці капралактаму, ачысткі прамысл. газавых выкідаў.

Тв.: Химия промышленных нефтей Белоруссии. Мн., 1972 (разам з М.С.Казловым, У.І.Куліковым); Гетерогенно-каталитическая изомеризация углеводородов. Мн., 1989 (разам з М.Ф.Саўчыцам, Э.Я.Усцілоўскай).

ЕДЫГЕ́Й, Ідыгу, Ідыку (1352—1419), эмір Белай Арды, заснавальнік *Нагайскай Арды.* Разам з ханам Цімур-Кутлукам пачаў вайну з *Тахтамышам.* У 1397 узначаліў войска *Залатой Арды.* У *бітве на Ворскле 1399* разбіў аб'яднаныя сілы вял. кн. літ. Вітаўта і Тахтамыша. Пасля смерці Цімур-Кутлука ў 1399 фактычна стаў на чале Залатой Арды, правёў аб'яднанне ўсіх ранейшых улусаў манг. палкаводца *Джучы.* У 1406 забіў Тахтамыша, у 1407 арганізаваў паход на г. Булгар. У 1408 напаў на Русь, разбурыў гарады Серпухаў, Дзмітраў, Растоў, Пераяслаў, Ніжні Ноўгарад, аблажыў Маскву, але не ўзяў яе. У час смуты 1410—12 Е. страціў уладу ў Ардзе і ўцёк у Харэзм. Забіты сынам Тахтамыша. Жыццю Е. прысвечаны гераічны эпас цюрк. народаў «Едыгей».

К.Б.**Езавітаў**.

ЕЗАВІ́ТАЎ Канстанцін Барысавіч (17.11.1893, г. Даўгаўпілс, Латвія — 23.5.1946), бел. паліт. і грамадскі дзеяч. Скончыў Віцебскі настаўніцкі ін-т (1916), Паўлаўскае ваен. вучылішча. Удзельнік 1-й сусв. вайны. У 1917—18 нам. старшыні і сакратар ваен. аддзела *Цэнтральнай беларускай вайсковай рады.* Удзельнік абвяшчэння БНР (25.3.1918), чл. яе Рады, нар. сакратар ваен. спраў у 1-м урадзе БНР. У 1919 нач. канцылярыі Мін-ва бел. спраў ва ўрадзе Літвы, кіраўнік Вайскова-дыпламат. місіі БНР у Латвіі і Эстоніі. Па даручэнні ўрада БНР устанавіў дыпламат. адносіны з урадамі Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі, звяртаўся да ўрада ЗША з просьбай аб аказанні ваен. дапамогі БНР, вёў работу па арганізацыі бел. войска. У 1920 урад БНР прысвоіў Е. званне ген.-маёра. З 1921 у Рызе, займаўся публіцыстычнай, грамадска-паліт. і культ.-асв. дзейнасцю сярод беларусаў. У 1923—24 дырэктар *Люцынскай дзяржаўнай беларускай гімназіі.* Удзельнік Усебел. канферэнцыі ў Празе (1921) і Берліне (1925). Неаднаразова быў арыштаваны сав. і латв. ўладамі. У жн. 1941 ва ўмовах ням. акупацыі стварыў і ўзначаліў у Рызе Бел. цэнтр. к-т (у 1942 пераўтвораны ў Бел. нац. аб'яднанне). На 2-м Усебел. кангрэсе (чэрв. 1944, Мінск) абраны ў склад *Беларускай цэнтральнай рады,* дзе ўзначаліў гал. ваен.

ўпраўленне, быў ген. інспектарам «беларускага вызваленчага войска», якое фарміравалася на тэр. Германіі. У чэрв. 1944 эвакуіраваўся ў Рыгу, у жн. 1944 — у Берлін. 26.4.1945 затрыманы сав. контрразведкай і перапраўлены ў Маскву, у ліст. 1945 — у Мінск. Памёр у турэмнай бальніцы ў час следства.

У.М.Міхнюк.

Е́ЗВА, Е з в а ў к а, рака ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., левы прыток р. Грэза (бас. р. Дняпро). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 126 км^2. Пачынаецца за 1 км на ПдЗ ад в. Старая Баяршчына. Рэчышча ад вытоку каналізаванае на працягу 14 км. У сярэднім цячэнні і ў нізоўі цячэ па забалочаным лесе.

ЕЗУ́ІТЫ (ад лац. формы імя Ісус Iesus), члены каталіцкага манаскага ордэна Таварыства Ісуса, створанага ў 1534 ісп. дваранінам І.Лаёлам для барацьбы з *Рэфармацыяй* і ўмацавання *каталіцызму*. Ордэн пабудаваны на аснове строгай цэнтралізацыі, суровай дысцыпліны і абсалютнай волі яго кіраўніка — генерала («чорнага папы»), які выбіраецца пажыццёва і падначальваецца толькі папе рымскаму. З цягам часу ордэн ператварыўся ў моцную арг-цыю, якая пашырылася ў Еўропе, пранікла ў краіны Афрыкі, Азіі, Паўд. Амерыкі. У 1569 Е. пачалі дзейнасць у ВКЛ. У 1773 булай папы Клімента XIV ордэн скасаваны. Ва ўсх. Беларусі Кацярына II насуперак папскай буле захавала ордэн. Е. заснавалі ў Полацку навіцыят (курсы падрыхтоўкі для ўступлення ў ордэн). Свае школы Е. вызвалілі ад урадавага кантролю і падначалілі Полацкаму калегіуму (з 1812 *Полацкая езуіцкая акадэмія*). Іх калегіумы існавалі ў многіх гарадах Беларусі, у т.л. ў Віцебску, Магілёве, Оршы (гл. *Калегіум, Езуіцкія навучальныя ўстановы*). У 1820 Е. былі выгнаны з Рас. імперыі. У 1814 ордэн адноўлены папам Піем VII ва ўсім свеце. У 1920—30-я г. ў Зах. Беларусі была створана каталіцка-езуіцкая група ў Альбярціне. У наш час Е. — адзін з буйнейшых і ўплывовых каталіцкіх ордэнаў.

Літ.: М а р а ш Я.Н. Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII в. Мн., 1974; Б л и н о в а Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. Мн., 1990; Ц я р о х і н С.Ф. Многія прыйдуць пад імем маім (езуіты на Беларусі). Мн., 1995.

Дз.У.Караў.

ЕЗУ́ІЦКАЕ ВЫХАВА́ННЕ, сістэма выхавання, распрацаваная ордэнам *езуітаў*. Яе прынцыпы і методыка выкладзены ў спец. школьным статуце «Ratio atque institutio studiorum Societatis Jesu» («План і арганізацыя заняткаў у грамадстве Ісуса»), зацверджаным у 1599. Адна з характэрных рыс Е.в. — адмова ад суровай дысцыпліны, якая існавала ў сярэдніх і вышэйшых школах сярэдневякоўя. Аднак езуітамі была распрацавана сістэма пакаранняў, якая прыніжала чалавечую годнасць вучняў (кайпак з асліными вушамі, ганебная лава і інш.) і сістэма ўзнагарод (пачэснае месца ў класе, адзнакі і г.д.). Настаўнікі-езуіты імкнуліся кантраляваць кірунак думак навучэнцаў, вялі за імі пастаянны нагляд. Е.в. было накіравана на падрыхтоўку вучняў да служэння каталіцкай царкве, аўтарытэту папы рымскага, вышэйшых царк. іерархаў (гл. таксама *Езуіцкія навучальныя ўстановы, Калегіум*).

В.Ф.Шалькевіч.

ЕЗУ́ІЦКІ КАЛЕ́ГІУМ, гл. ў арт. *Калегіум*.

ЕЗУ́ІЦКІЯ НАВУЧА́ЛЬНЫЯ ЎСТАНО́ВЫ, навучальныя ўстановы, якія засноўваліся *езуітамі* ў Беларусі, Украіне і Літве. Існавалі з 2-й пал. 16 ст. да пач. 19 ст. Былі пач., сярэднія (*калегіумы*) і вышэйшыя (акадэміі: Віленская, гл. *Віленскі універсітэт*; *Полацкая езуіцкая акадэмія*) школы. Першая Е.н. ў. — езуіцкі калегіум у Вільні (1570). Потым Е.н.ў. з'явіліся ў іншых гарадах Беларусі, была створана шырокая сетка такіх устаноў. Найчасцей яны размяшчаліся ў прыгожых светлых будынках (захаваліся ў Пінску, часткова ў Полацку), дзе падтрымліваўся ўзорны парадак (гл. *Езуіцкае выхаванне*). У 1870-я г. Е.н.ў. перададзены *Адукацыйнай камісіі*. Існавалі на Беларусі да 1820.

В.Ф.Шалькевіч.

Е́ЗУС, Э з у с, у кельцкай міфалогіі гал. бажаство. Уяўлялі яго барадатым каля дрэва з серпападобнай сякерай у руцэ. Яму прыносілі ахвяры і вешалі іх на дрэве. З дрэвам Е. асацыіравалі быка, які нясе на сабе трох журавоў. Выявы Е. вядомы на гала-рымскіх рэльефах алтароў Парыжа і Трыра.

ЕЗЯРЫ́ШЧА, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Обаль, за 42 км на Пн ад г. Гарадок. Уваходзіць у арніталагічны заказнік Езярышчанскі. Пл. 15,39 км^2, даўж. каля 8,9 км, найб. шыр. 3,2 км, найб. глыб. 11,5 м, даўж. берагавой лініі 32,8 км. Пл. вадазбору 264 км^2. Схілы катлавіны выш. да 5 м; месцамі да 25 м, пераважна разараныя, часткова пад пашай і сенажаццю. Берагі пясчаныя, паўн. і паўн.-зах. месцамі абразійныя. Дно няроўнае (шмат упадзін і меляў), да глыб. 4—6 м пясчанае, ніжэй сапрапелістае. 20 астравоў агульнай пл. 0,67 км^2. Шыр. паласы надводнай раслінасці да 120 м. Падводная раслінасць пашырана да глыб. 2—2,5 м. Упадаюць 8 ручаёў, рэкі Агнеш і Дубоўка, выцякае р. Обаль. Гняздуецца больш за 60 відаў птушак.

ЕЗЯРЫ́ШЧА, гарадскі пасёлак у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., на беразе воз. Езярышча. За 41 км ад Гарадка, 80 км ад Віцебска. Чыг. ст. на лініі Віцебск—Невель, на аўтадарозе Віцебск—Невель. 2,2 тыс. ж. (1997). Упершыню ўпамінаецца ў апошняй чвэрці 14 ст. як уладанне Ульяны Цвярской, удавы вял. кн. ВКЛ Альгерда. У 14—17 ст. існаваў *Езярышчанскі замак*. З 1583 мястэчка, пазней цэнтр дзярж. староства ў Віцебскім пав. У 1772 далучана да Рас. імперыі, цэнтр воласці ў Гарадоцкім пав. З 1886 сяло, 204 ж., 31 двор, царква, 2 карчмы. У 1906 у Е. 270 ж., 37 двароў. У 1924—29 цэнтр *Езярышчанскага раёна*, з 1935 — Мехаўскага р-на. У 1929—35 у Гарадоцкім р-не. У

Бог **Езус** каля свяшчэннага дрэва. Гала-рымскі барэльеф.

Возера **Езярышча**.

Вял. Айч. вайну з 17.7.1941 па 19.12.1943 акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў Е. і раёне загубілі 2974 чал. У 1942 партызаны рагрмілі фаш. гарнізон на станцыі Е. (гл. *Езярышчанскі бой 1942*). З 4.10.1957 Е. — гар. пасёлак. З 1958 цэнтр Езярышчанскага р-на, з 1962 у складзе Гарадоцкага р-на. 2,7 тыс. ж. (1971). Прадпрыемствы харч. прам-сці. Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання. Вайсковыя могілкі, 4 магілы ахвяр фашызму. За 3 км ад гар. пасёлка на востраве воз. Езярышча археал. помнік — Замчышча (16 ст.).

ЕЗЯРЫ́ШЧАНСКІ БОЙ 1942, аперацыя 2-й імя Панамарэнкі і 4-й Бел. партыз. брыгад па разгроме ням.-фаш. гарнізона на чыг. ст. Езярышча Віцебскай вобл. 7 вер. ў Вял. Айч. вайну. Мэта — сарваць перавозкі па чыг. Невель—Віцебск. Кіраўніцтва аперацыяй ажыццяўляў нач. аб'яднанага штаба партыз. войск Полацкай зоны А.Я.Марчанка. У ходзе бою партызаны знішчылі чыг. станцыю, склады з боепрыпасамі, харчаваннем, папсавалі чыг. палатно, забралі апаратуру дыспетчарскага кіравання і радыёапаратуру.

ЕЗЯРЫ́ШЧАНСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 14—17 ст. Размяшчаўся за 3 км ад г.п. *Езярышча* Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. У плане чатырохвугольнік (100 × × 120 м). Быў абкружаны земляными валамі з 3 вежамі і ровам, які аддзяляў замак ад астатняй тэр. паўвыспы. У час паводак замак ператвараўся ў астраўную крэпасць. Паводле польскага хранікста Р.Гейдэнштэйна, у 16 ст. Е.з. меў значныя ўмацаванні і разам з Полацкім замкам панаваў над «усім краем». У Лівонскую вайну 1558—83 узяты рус. войскам (1565) і спалены, потым адбудаваны. У 1579 яго знішчылі ў час штурму войскі караля Стафана Баторыя, пазней адноўлены. У пач. 17 ст. ў час пажару ўмацаванні замка згарэлі, адбудаваны па загадзе караля Жыгімонта III Вазы езярышчанскім старостам К.Сакалінскім. У жн. 1654 замак захапіла рус. войска на чале з ваяводам С.Стрэшневым. Захаваліся рэшткі валоў. *В.М.Ляўко.*

ЕЗЯРЫ́ШЧАНСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—29 і 1958—62. Утвораны 17.7.1924 у складзе *Віцебскай акругі*. Цэнтр — ст. Езярышча. Падзяляўся на 8 сельсаветаў. 12.10.1929 раён скасаваны, яго тэр. далучана да *Гарадоцкага раёна*. 12.2.1935 утвораны *Мехаўскі раён* з цэнтрам на ст. Езярышча, які 18.3.1958 перайменаваны ў Е.р. Быў у складзе Віцебскай вобл. Уключаў г.п. Езярышча і 9 сельсаветаў (у 1960 — 11 сельсаветаў). 25.12.1962 раён скасаваны, яго тэр. далучана да Гарадоцкага р-на.

ЕЙСК, горад у Расіі, у Краснадарскім краі, порт на беразе Таганрогскага зал. Азоўскага м. 80,5 тыс. ж. (1992). Эканамічны цэнтр Кубанскага Прыазоўя. Чыг. станцыя, вузел аўтадарог, аэрапорт. Цэнтр рыбапрамысл. раёна. Прадпрыемствы харчасмакавай, лёгкай, камбікормавай, дрэваапр. (мэблевая ф-ка) і маш.-буд. (з-ды паліграфічных машын, станкабуд., суднарамонтны, «Атракцыён») прам-сці. Вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча. Музеі гісторыка-краязнаўчы і мастацкі. Прыморскі кліматычны і бальнеалагічны курорт. Клімат умераны, з рысамі марскога, з вельмі цёплым летам. Характэрная асаблівасць — ветранае сонечнае надвор'е (брызы). Мясц. мінер. воды і глеевыя гразі Ханскага воз. з інш. сродкамі выкарыстоўваюцца для лячэння хвароб органаў руху і апоры, гінекалагічнай сферы, нерв. і сардэчна-сасудзістай сістэм, скуры.

ЕЙСКІ ЛІМА́Н, мелкаводны заліў каля паўн.-ўсх. берага Азоўскага м. Утвораны вусцем р. Ея, адгароджаным ад мора Ейскай і Глафіраўскай пясчанымі касамі. Даўж. каля 24 км, шыр. да 13 км, глыб. да 3,2 м. На зах. беразе лімана — г. Ейск.

ЕКАЦЯРЫНБУ́РГ, горад у Расіі, цэнтр Свярдлоўскай вобл., на р. Ісець (Сярэдні Урал). 1278 тыс. ж. (1996). Буйны чыг. і аўтадарожны вузел. Аэрапорт. Метрапалітэн. Газаправоды. Найбуйнейшы цэнтр машынабудавання (ВА «Уралмаш», «Уралэлектрацяжмаш», «Уралхіммаш»; з-ды турбаматорны, буравога і металургічнага абсталявання, трансп. машынабудавання, падшыпнікавы і інш.), чорнай металургіі (Верх-Ісецкі металургічны з-д); развіты таксама прыладабуд. і эл.-тэхн. (кабель, трансфарматары, з-ды дакладнай механікі, оптыкі, халадзільнікаў і інш.), хім. (шыны, пластмаса і інш.), хім.-фармацэўтычная, лёгкая, харчасмакавая прам-сць; каменярэзная вытв-сць (з-д «Уральскія самацветы»). Уральскае аддзяленне Рас. АН, 14 ВНУ (у т.л. ун-т), 8 музеяў, 5 тэатраў. Арх. помнікі: жылыя і грамадскія будынкі ў стылі класіцызму (18, 19 ст.), сабор Аляксандра Неўскага (1-я пал. 19 ст.).

Засн. ў 1721 В.М.Таціпчавым як горназаводскі культ. і гандл. цэнтр Урала. Пазней Ісецкі з-д і крэпасць назвалі Е. у гонар *Кацярыны I*. Тут размяшчаліся Уральскае горнае ўпраўленне, горназаводская школа, з 1735 манетны двор. У 1763 праз Е. пракладзены Сібірскі тракт. З 1781 цэнтр вобласці, з 1796 пав. горад Пермскай губ. У 1834 засн. Горны музей, у 1836 — абсерваторыя. З канца 19 ст. важны чыг. цэнтр Урала, адзін з цэнтраў рэв. руху. У ліп. 1918 у Е. расстраляны апошні рас. імператар *Мікалай II* з сям'ёй. Месца значных баёў у грамадз. вайну (гл. *Чэхаславацкага корпуса мяцеж 1918*). З 1919 цэнтр Екацярынбургскай губ., з 1923 — Уральскай, з 1934 — Свярдлоўскай абласцей. У 1924—91 наз. Свярдлоўск.

Екацярынбург. Кінаканцэртная зала «Космас».

ЕКЕЛЬЧЫК Міхаіл Емяльянавіч (28.12.1928, Мінск — 19.11.1976), бел. спецыяліст у галіне вытв-сці выліч. тэхнікі. Скончыў Саратаўскі ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1951). З 1958 на Мінскім з-дзе ЭВМ, з 1964 гал. інжынер Брэсцкага з-да эл.-вымяральных прылад. Займаўся распрацоўкай і асваеннем серыйнай вытв-сці ЭВМ тыпу «Мінск», ЕС ЭВМ і выліч. комплексаў спец. прызначэння. Дзярж. прэмія СССР 1970. *М.П.Савік.*

ЕЛГАВА (Jelgava), горад у Латвіі, прыстань на р. Лялупе. 73,9 тыс. ж. (1992). Чыг. вузел. Прам-сць: машынабуд. (з-ды «РАФ», с.-г. машын), металаапр., лёгкая і харчовая. С.-г. акадэмія. Музеі: краязнаўчы, гіст. і мастацкі. Арх. помнікі: касцёл св. Ганны (1573—1641), барочны палац Бірона (18 ст., арх. В.Растрэлі, перабудаваны ў 19 і 20 ст., на месцы замка 13 ст.), т.зв. Акадэмія Пятра (1771, цяпер музей), т.зв. Віла Медэма ў стылі класіцызму (пач. 19 ст.).

Засн. ў 1226. Наз. Мітава (да 1917) ад аднайм. замка, пабудаванага Лівонскім ордэнам у 1265. У 1561—1795 сталіца Курляндскага герцагства (з 1573 горад). У 1795 далучана да Расіі, цэнтр Курляндскай губ. У 1920—40 і з 1991 горад у Латв. рэспубліцы, у 1940—90 у Латв. ССР. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны ням.-фаш. войскамі (1941—44).

ЕЛЕНКА, рака ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл. і Крупскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. Бобр (бас. р. Дняпро). Даўж. 38 км. Пл. вадазбору 170 км^2. Выцякае з воз. Камачэўскае на тэр. Талачынскага р-на. Рэчышча каналізаванае ад вытоку на працягу 6 км. Цячэ пераважна па забалочаным лесе.

ЕЛЕНКА, рака ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. Беседзь (бас. р. Дняпро). Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 102 км^2. Пачынаецца за 1,1 км на ПнУ ад в. Зелянец. Рэчышча каналізаванае ад вытоку на працягу амаль 7 км.

ЕЛІЗАВЕ́ЦІНСКАЯ ШКЛЯНА́Я МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1844—66 у в. Елізавеціна Клімавіцкага пав. (цяпер у наваколлі в. Мокрае Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл.). Выпускала аконнае шкло. У 1866 працавалі 44 чал. Сыравіну набывалі: гліну ў Калужскай і Чарнігаўскай губ., пясок у Смаленскай губ., саламяны попел у Чарнігаўскай губ. Шкло збывалі ў Віцебскую і Магілёўскую губ., Крамянчуг, Харкаў, Палтаву, Мінск і інш.

ЕЛІЗА́РАЎ Альберт Сцяпанавіч (н. 13.1.1937, г. Архангельск, Расія), бел. вучоны ў галіне прыладабудавання. Д-р тэхн. н. (1972), праф. (1977). Скончыў Ленінградскі ін-т авіяц. прыладабудавання (1960). З 1975 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па радыёвымяральных прыладах. Распрацаваў вектарныя аналізатары радыётэхн. ланцугоў звышвысокачастотнага дыяпазону і на іх аснове новыя віды ўзроўнямераў.

Тв.: Автоматизация измерений параметров линейных невзаимных СВЧ четырехполюсников. М., 1978; Электрорадиоизмерения. Мн., 1986.

ЕЛІЗА́Р'ЕЎ Валянцін Мікалаевіч (н. 30.10.1947, Баку), бел. балетмайстар. Нар. арт. Беларусі (1979), нар. арт. СССР (1985). Акад. Міжнар. слав. акадэміі (1996), Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў у С.-Пецярбургу (1997). Праф. Бел. акадэміі музыкі (1995). Скончыў Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча імя А.Ваганавай (1967), балетмайстарскае аддзяленне Ленінградскай кансерваторыі (1972). Стажыраваўся ў Францыі па стыпендыі ЮНЕСКА (1982). З 1973 гал. балетмайстар Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1996 дырэктар — маст. кіраўнік Нац. акад. т-ра балета Беларусі, дзе стварыў усе свае асн. пастаноўкі: «Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ—Р.Шчадрына (1974), «Стварэнне свету» А.Пятрова (1976), «Тыль Уленшпігель» Я.Глебава (1978), «Спартак» А.Хачатурана (1980), «Шчаўкунок» П.Чайкоўскага (1982), «Карміна Бурана» на муз. К.Орфа (1983), «Балеро» на муз. М.Равеля (1984), «Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага (1986, 1997), «Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева (1988), «Дон Кіхот» Л.Мінкуса (1989), «Страсці» («Рагнеда») А.Мдывані (1995, Дзярж. прэмія Беларусі 1996). Ставіў балеты таксама ў Расіі, Польшчы, Югаславіі, Турцыі. Стваральнік харэаграфіі для тэлефільма «Фантазія» («Веснавыя воды», паводле І.Тургенева) з удзелам М.Плісецкай (1975, Цэнтр. тэлебачанне, рэж. А.Эфрас) і інш. У творчасці імкнецца да ўвасаблення значных тэм сучаснасці. У харэаграфічнай мове шырока выкарыстоўвае прыёмы сучаснай пластыкі. Яго дзейнасць спрыяла міжнар. прызнанню бел. балетнага т-ра. Пад кіраўніцтвам Е. бел. балет з поспехам гастраліраваў амаль у 30 краінах свету. Яго творчасці прысвечаны тэлефільмы «Стварэнне» (1979) і «Валянцінаў дзень» (1993, рэж. абодвух В.Шавялевіч). Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу балетмайстраў і артыстаў балета (1970), 7-га Міжнар. конкурсу артыстаў балета (1993, Масква, спец. прыз), прэміі «Чалавек года» ў галіне муз. мастацтва з уручэннем прыза «Залатая Неферціці» (1996), вышэйшай узнагароды Міжнар. асацыяцыі танца пад эгідай ЮНЕСКА «Бенуа дэ ла данс» (Парыж, 1996). Чл. Савета Еўропы па культуры (1990), старшыня і чл. журы міжнар. конкурсаў балета ў Маскве, Варне (Балгарыя), Нагоі (Японія), Кіеве, Віцебску.

Літ.: Народный артист СССР Валентин Елизарьев. Мн., 1987; Чурко Ю.М. Искусство, созвучное времени // Чурко Ю.М. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988; Валентин Елизарьев: [Альбом]. Мн., 1997.

Т.М.Мушынская.

ЕЛІСЕ́ЕВІЧЫ, археалагічная стаянка эпохі палеаліту ў в. Елісеевічы Бранскай вобл. (Расія), на правым беразе р. Судасць. Адкрыў у 1930 К.М.Палікарповіч, даследавалі Л.В.Грэхава і бел. археолагі А.Дз.Будзько і Палікарповіч. У культурным пласце на глыбіні 1,2—1,3 м выяўлена вял. колькасць касцей маманта (чарапы, буйныя трубчастыя косці), верагодна, рэшткі жытлаў ці гасп. пабудоў. Знойдзены крамянёвыя прылады працы, прылады з касцей маманта, ваўка, ліса, пяца, зайца і інш. жывёл, сусветна вядомыя маст. вырабы з касцей маманта (статуэтка жанчыны, выявы рыб, пласціны са складаным геам. арнаментам). Стаянка датуецца 12 970 — 17 340 да н.э.

В.М.**Елізар'еў**.

Сцэна з балета «Спартак» у пастаноўцы В.**Елізар'ева**.

ЕЛІСЕ́ЕНКАЎ Алег Мікалаевіч (н. 21.9.1958, г. Спас-Дземенск Калужскай вобл., Расія), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1982, клас Дз.*Смольскага*). З 1986 выкладае ў Бел. ун-це культуры. З 1997 гал. рэдактар рэдакцыі муз. і забаўляльных праграм Бел. тэлебачання. Працуе ў розных жанрах. Яго сімф. музыцы ўласціва спалучэнне прыёмаў скразнога развіцця з канцэртаваннем, стылістыкі барока і класіцызму з сучаснай кампазіцыйнай тэхнікай. Сярод твораў: кантата «Купалаў час» на словы Я.Купалы (1982); сімфоніі — 1-я і 3-я (1980, 1986), камерныя 2-я і 4-я (1981, 1986); «Дывертысмент» і «Камерная музыка» для стр. арк.; камерна-інстр. творы, у т.л. санаты, санаціна, «Варыяцыі» для цымбалаў (1990); п'есы для рок-гурта, біг-бэнда і спрынг-бэнда; песні на словы бел. і інш. паэтаў; музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў.

ЕЛІСЕ́ЕЎ Аляксандр Васілевіч (13.8.1859, г. Суаменліна, Фінляндыя — 3.6.1895), рускі падарожнік. Скончыў Ваенна-мед. акадэмію ў Пецярбургу (1882). Падарожнічаў на Пн і ПнУ Еўрап. Расіі, Швецыі, Нарвегіі, Фінляндыі. Вядомы як даследчык М. Азіі і Афрыкі. У 1881—82 наведаў Егіпет, Палесціну і Сірыю, у 1884—87 падарожнічаў па Лівіі, Алжыры, Тунісе, М. Азіі, у 1895 — па Эфіопіі. Сабраў шматлікія антрапал. і этнагр. звесткі.

Тв.: По белому свету: Очерки и картины из путешествий по трем частям Старого света. 2 изд. Т. 1—4. СПб., 1901—04.

ЕЛІСЕ́ЕЎ Аляксей Станіслававіч (н. 13.7.1934, г. Жыздра Калужскай вобл., Расія), савецкі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1969), лётчык-касманаўт СССР (1969), д-р тэхн. н. (1973). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (МВТВ) імя М.Э.Баўмана (1957). З 1966 у атрадзе касманаўтаў. 15—16.1.1969 з Б.В.*Валынавым* і Я.В.*Хруновым* здзейсніў палёт на касм. караблі «Саюз-5» (як бортінжынер), 16.1.1969 з Хруновым перайшоў праз адкрыты космас (37 мін) у касм. карабель «Саюз-4» (пілатаваў У.А.*Шаталаў*), на якім 17.1.1969 вярнуўся на Зямлю. 13—18.10.1969 з Шаталавым здзейсніў палёт на касм. караблі «Саюз-8» (як бортінжынер), 23—25.4.1971 з Шаталавым і М.М.*Рукавішнікавым* — палёт на

касм. караблі «Саюз-10» (як бортінжынер). У ліпені 1975 — кіраўнік палёту па праграме «*ЭПАС*». З 1985 рэктар МВТВ імя Баўмана. Правёў у космасе 8,9 сут. Залаты медаль імя К.Э.Цыялкоўскага АН СССР. Залаты медаль імя Ю.А.Гагарына. Дзярж. прэмія СССР (1980).

А.С.Елісееў.

ЕЛІСЕ́Й, Э л і ш а, старазапаветны біблейскі прарок, вучань *Ілы* (гіст. — прарок, які жыў у *Ізраільскім царстве* ў 850—800 да н.э.). Паводле Біблії Е. быў сведкам узнясення Ілы на неба на вогненнай калясніцы, пасля чаго сам набыў здольнасць здзяйсняць цуды.

ЕЛІСЕ́ЙСКІ ДАГАВО́Р, гл. *Германа-французскі дагавор 1963*.

ЕЛІСЕ́ЙСКІЯ ПАЛІ́, 1) у старажытнагрэчаскай міфалогіі мясціна шчасця; тое, што *Элізіум*. 2) Адна з гал. і парадных вуліц Парыжа ў зах. частцы горада, паміж пл. Згоды і пл. Шарля дэ Голя, дзе размешчаны рэзідэнцыя прэзідэнта Францыі (Елісейскі палац), фешэнебельныя магазіны, гасцініцы, рэстараны, кінатэатры і інш.

Е́ЛКА (Picea), род голанасенных раслін сям. хваёвых; адна з гал. лесаўтваральных парод. Каля 45 відаў. Пашырана пераважна ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. На Беларусі 1 дзікарослы від — Е. звычайная, або еўрапейская (P. abies), і 13 інтрадукаваных: Е. калючая (P. pungens), канадская, або белая (P. canadensis), сербская, або балканская (P. omorica), Энгельмана (P. engelmannii), сібірская (P. obovata), усходняя (P. orientalis) і інш. Е. звычайная распаўсюджана амаль па ўсёй тэр. Беларусі і мае паўд. мяжу арэала (адначасова гэта і паўд. мяжа Еўразіяцкай хвойна-лясной геабат. падвобласці). На Палессі трапляецца ў выглядзе ізаляваных астравоў. Вядома 31 астраўное насаджэнне, 5 з іх — ельнікі Гарбавіцкія, Добрушскія, Маларыцкія, Мяднянскія і Пажэжынскія — помнікі прыроды рэсп. значэння.

Даўгавечныя (жывуць да 300—500 і больш гадоў); аднадомныя, шматгадовазялёныя дрэвы з прамым ствалом і густой конусападобнай кронай. Е. звычайная мае мноства дэкар. форм: з пірамідальнай, ніцай, шарападобнай і інш. кронамі. Каранёвая сістэма часцей паверхневая. Кара тонкая, у маладых дрэў гладкая, потым пласціністая. Галінкі размешчаны даволі правільнымі кальчакамі. Лісце (ігліца) 4-граннае, радзей пляскатае, востраканцовае, спіральна або невыразна двухрадкова размешчанае, трымаецца на галінках 7—9 і больш гадоў. *Стробілы* (шышкі) паяўляюцца ўвесну на леташніх парастках: мікрастробілы (мужч. шышкі) — па некалькі ў пазухах лускападобнага лісця; мегастробілы (жан. шышкі) — адзіночныя, размешчаны бліжэй да верхавінак. Спелыя шышкі падоўжана-цыліндрычныя, верацёна- або яйцападобныя, звіслыя, ападаюць пасля выспявання насення. Насенне з лыжкападобнымі крыльцамі, выспявае восенню ў год апылення. Размнажаецца насеннем і зрэдку вегетатыўна (атожылкамі). Драўніна мяккая, выкарыстоўваецца ў буд-ве, вытв-сці цэлюлозы, муз. інструментаў; з яе атрымліваюць смалу, шкіпінар, каніфоль, дзёгаць. Кара — асн. сыравіна ў вытв-сці дубільнікаў (танідаў). Большасць відаў — дэкар. дрэвы, выкарыстоўваюцца ў садова-паркавым буд-ве і як ахоўныя насаджэнні ўздоўж дарог.

Г.У.Вынаеў.

ЕЛСУКО́Ў Альберт Мікалаевіч (н. 9.12.1936, г. Архангельск, Расія), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1986), праф. (1988). Скончыў БДУ (1963). У 1964—66, 1969—73 выкладаў у Бел. політэхн. ін-це. З 1973 у БДУ (з 1987 заг. кафедры філасофіі, з 1989 — сацыялогіі). Даследуе праблемы філасофіі, сацыялогіі, метадалогіі і гісторыі навукі. Адзін з аўтараў дапаможніка для ВНУ па гісторыі сацыялогіі, сацыялагічных слоўнікаў і інш.

Тв.: Методы научного познания. Мн., 1974 (разам з В.С.Сцёпіным); Эмпирическое познание и факты науки. Мн., 1981; Познание и миф. Мн., 1984.

Е́ЛЬМСЛЕЎ (Hjelmslev) Луі Троль (3.10.1899, Капенгаген — 30.5.1965), дацкі мовазнавец. Праф. Капенгагенскага ун-та (з 1937). У 1931 разам з В.*Брэндалем* заснаваў Капенгагенскі лінгвістычны гурток (гл. ў арт. *Структурная лінгвістыка*), які ўзначальваў да 1965. Рэдактар час. «Acta Linguistica» («Лінгвістычныя справы»). Разам з Х.Ё.Ульдалем распрацаваў арыгінальную лінгвістычную тэорыю — *гласематыку* («Пралегомены да тэорыі мовы», 1943); прапанаваў агульную тэорыю склону («Катэгорыя склону. Даследаванне па агульнай граматыцы», 1935). Аўтар працы «Мова» (1963).

А.А.Кожынава.

Е́ЛЬНА, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка, за 3 км на ПнЗ ад г. Браслаў. Уваходзіць у *Браслаўскую групу азёр*. Пл. 0,46 км², даўж. 1,6 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 6 м, даўж. берагавой лініі 4,2 км. Пл. вадазбору 138 км². Схілы катлавіны на У і Пд выш. 10—13 м, параслі хваёвым лесам, астатнія выш. 2—6 м, на Пн разараныя. Берагі пад хмызняком. Мелкаводдзе да глыб. 1 м пясчанае, ніжэй дно сапрапелістае. Зарастае. Упадаюць 5 ручаёў, у т.л. Бярэжа, на Пн вышэйшае ручай у воз. Струста.

Е́ЛЬНЕНСКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1897—1916 у в. Ельня Слуцкага пав. (цяпер вёска ў Ганцавіцкім р-не Брэсцкай вобл.). У 1900—13 наз. завод аконнага шкла «Ганцавічы». Меў лакамабіль (12 к.с.) і паравы кацёл. У 1913 працавалі 62 чал., з-д выпускаў высакаякаснае аконнае і люстраное шкло.

Е́ЛЬНІКІ, тое, што *яловыя лясы*.

Елка звычайная.

Е́ЛЬНІКІ, радовішча глін і суглінкаў у Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., каля в. Праскурні. Пластавы паклад звязаны з неагенавымі адкладамі. Гліны і суглінкі тугаплаўкія, высокапластычныя, з рэдкімі праслоямі гліністага пяску, прасочваецца чаргаванне каляровых і літалагічных рознасцей. Разведаныя запасы 7,66 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 6,3—18,2 м, ускрышы (пяскі, супескі, суглінкі) 0,2—6,7 м. Гліны і суглінкі прыдатныя на выраб цэглы. Радовішча распрацоўваецца.

А.П.Шчураў.

Е́ЛЬНЯ, рака ў Краснапольскім і Слаўгарадскім р-нах Магілёўскай вобл., левы прыток р. Сож (бас. Дняпра). Даўж. 30 км. Пл. вадазбору 170 км^2. Пачынаецца з балота паміж в. Чэрнін і в. Новае Жыцё Краснапольскага р-на. Даліна пераважна трапецападобная, шыр. 250—500 м. Пойма перарывістая. Рэчышча каналізаванае ад вытоку на працягу амаль 6 км, далей — звілістае.

Е́ЛЬНЯ, рака ў Шчучынскім і Мастоўскім р-нах Гродзенскай вобл., правы прыток р. Нёман. Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 123 км^2. Пачынаецца на ПнЗ ад в. Барташы Шчучынскага р-на. На працягу 18 км каналізаваная.

Е́ЛЬНЯ, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Яльнянка, за 16 км на ПдУ ад г. Міёры, у межах гідралагічнага заказніка *Ельня*, сярод вярховага балота Мох. Пл. 5,4 км^2, даўж. 4,9 км, найб. шыр. 1,5 км, найб. глыб. 3,5 м, даўж. берагавой лініі каля 15 км. Пл. вадазбору 14,4 км^2. Схілы катлавіны невыразныя. Берагі на З і Пн выш. да 1,5 м, на У і ПнУ пясчана-жвіровыя, шмат валуноў. Дно плоскае, сапрапелістае, каля зах. берага тарфяністае, каля ўсх. — пясчана-жвіровае. Уздоўж берагоў рэдкі трыснёг і чарот. Сцёк у воз. Чорнае.

Возера **Ельня** (Міёрскі раён).

Е́ЛЬНЯ, балота ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., пераважна ў вадазборы рэк Волта (на Пн), Бярэжа (на Пд), Яльнянка (на У). Вярховага тыпу. На балоце група азёр, найб. Ельня, Доўгае, Белае, Бярэжа, Чорнае, Яжгіна. Пл. 20 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 16,8 тыс. га. Глыб. торфу да 8,3 м, сярэдняя 3,8 м. Ёсць сапрапель магутнасцю да 1,5 м, гідролізная сыравіна. Балота ў натуральным стане; уваходзіць у гідралагічны заказнік *Ельня*.

Е́ЛЬНЯ, гідралагічны заказнік рэсп. значэння ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Засн. ў 1968 з мэтай захавання ў натуральным стане балотнага масіву *Ельня* і характэрнай для яго расліннасці. Пл. 23,2 тыс. га (1997). Размешчаны на Полацкай нізіне. У межах заказніка каля 30 дыстрофных азёр, у т.л. Ельня, Доўгае, Чорнае. Асн. тэрыторыя — хмызнякова-сфагнавае балота прыбалт. тыпу. У балотнай расліннасці пераважаюць хваёва-кусцікава-сфагнавыя, кусцікава-сфагнавыя, бярозава-палітрыхавыя згуртаванні, выразныя градава-мачажынны і градава-азёрны раслінныя комплексы. На мінеральных «астравах» лясная расліннасць: ельнікі сніткавыя, бярэзнікі вейнікавыя, чорнаалешнікі прыручайна-травяныя і інш. У флоры заказніка каля 300 відаў раслін. Трапляюцца рэдкія ахоўныя віды раслін (чубатка пустая, бяроза карлікавая, марошка, шпажнік чараліцавы) і жывёл (гагара чорнаваллёвая, дзербнік, журавель шэры, курапатка белая і інш.).

ЕЛЬСК, горад, цэнтр Ельскага р-на Гомельскай вобл. За 177 км ад Гомеля. Чыг. ст. на лініі Калінкавічы— Оўруч (Украіна). 11,2 тыс. ж. (1997).

Паводле пісьмовых крыніц вядомы з 16 ст., у Мазырскім пав. ВКЛ. Меў таксама назву Каралін. Належаў Спадам, Казіміру Аскерку. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка ў Мазырскім пав. У 1886 у Е. 44 двары, вінакурны з-д, 3 крамы, школа, царква, з 1873 чыг. станцыя; у 1897 — 600 ж. З 1924 цэнтр *Каралінскага раёна*, з 1931 — *Ельскага раёна*. З 27.9.1938 гар. пасёлак. У 1939 — 3,9 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну з 23.8.1941 да 11.1.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Е. і раёне 5435 чал. Дзейнічала *Ельскае патрыятычнае падполле*. 4,8 тыс. ж. у 1959; 6,7 тыс. ж. у 1971. З 5.7.1971 горад.

Прадпрыемствы лесанарыхтоўчай, дрэваапр., харч., буд. матэрыялаў прам-сці. Дзейнічае *Ельскі краязнаўчы музей*. Брацкія магілы сав. воінаў, партызан і падпольшчыка. Помнік архітэктуры — *Ельская Троіцкая царква* (1769—80).

Е́ЛЬСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ. Дзейнічала са жн. 1941 да снеж. 1943 у Ельску і Ельскім р-не Гомельскай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Мела групы ў Ельску (кіраўнікі Я.М.Шацко, А.І.Сухамель), в. Скароднае (М.Н.Драчэўскі), в. Болгарка (І.Р.Шульга). Падпольшчыкі вялі агітработу сярод насельніцтва і ў вайск. фарміраваннях акупантаў (у выніку да партызан перайшло 40 славакаў), распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі, падп. газ. «Кліч Радзімы», праводзілі дыверсіі на чыгунцы і інш. аб'ектах ворага, здабывалі для партызан зброю, боепрыпасы, медыкаменты, харч. прадукты, рабілі завалы на дарогах, псавалі тэлефонна-тэлегр. сувязь; балгарская група інфармавала партызан пра рух варожых войск, здабывала зброю, удзельнічала з партызанамі ў дыверсіях.

Ельская Троіцкая царква.

Е́ЛЬСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1943, баі 37-й Ельскай партыз. брыгады ва ўзаемадзеянні з 12-м гвардз. стралк. палком Чырв. Арміі супраць ням.-фаш. захопнікаў у ліст. і снеж. за вызваленне г. Ельск у Вял. Айч. вайну. Вылучаныя для ўдзелу ў аперацыі стралк. полк і артдывізіён 1-га Укр. фронту партызаны скрытна правялі ў тыл. ворага. У ноч на 27 ліст. пасля артпадрыхтоўкі партызаны і сав. воіны ўварваліся ў Ельск, гарнізон якога налічваў каля 600 гітлераўцаў, і за 2 гадз авалодалі ім. Пасля 3 дзён беспаспяховых контратак гітлераўцы, падтрыманыя 54 танкамі і самаходнымі гарматамі, 29 ліст. занялі горад. Праціўнік страціў больш за 450 салдат і афіцэраў. 9 снеж. 37-я Ельская партыз. брыгада ва ўзаемадзеянні з 415-й стралк. дывізіяй вызваліла Ельск.

Е́ЛЬСКАЯ ТРО́ІЦКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства. Пабудавана ў 1769—80 у г. Ельск Гомельскай вобл. Мае рысы класіцызму. 5-зрубны крыжова-купальны храм. Цэнтр. 8-гранны зруб (даўж. 23 м, шыр. 14 м, выш. 11,8 м) завершаны масіўным светлавым васьмерыком з купальным пакрыццём. Прамавугольны бабінец, гранёныя алтарныя і бакавыя зрубы накрыты пакатымі 2-схільнымі дахамі з вальмамі на тарцах. Сцены вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, вокны з паўцыркульнымі завяршэннямі. У 1870—71 да бабінца прыбудавана званіца (васьмярык на 2 чацверыках), завершаная высокім шатром.

А.К.Ельскі.



М.К.Ельскі.

Е́ЛЬСКІ Аляксандр Карлавіч (16.6.1834, в. Дудзічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 10.9.1916), бел. гісторык, этнограф, краязнавец, пісьменнік, перакладчык, публіцыст. Чл. Акадэміі навук у Кракаве (1892). Брат М.К.*Ельскага*. Скончыў Мінскую гімназію (1852). З 1860-х г. жыў у Замосці (Пухавіцкі р-н), дзе ў 1864 стварыў літ.-краязнаўчы музей. Сябра і першы біёграф В.*Дуніна-Марцінкевіча*. Аўтар дыдактычных вершаваных і празаічных гутарак на бел. мове ў духу асветніцтва і хрысціянскай маралі. Гісторыі, этнаграфіі, фальклору, мове і л-ры Беларусі прысвечаны яго працы: «Пра беларускую гаворку» (1885), «Слоўца пра матэрыялы для вывучэння беларускай гаворкі, этнаграфіі і літаратуры» (1886), «Адам Міцкевіч на Беларусі» (1890), «Беларуская літаратура і бібліяграфія» (1892), «Нарыс гісторыі мясцовай гаспадаркі ў супастаўленні з народнымі звычаямі ад першабытных да апошніх часоў» (т. 1—2, 1893—97), «Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку» (1893), «Гістарычныя звесткі пра фабрыку шкла і аздобных люстэрак у радзівілаўскім Урэччы на Літве» (1899) і інш. Напісаў каля 10 тыс. гіст.-краязнаўчых артыкулаў для «Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краёў», «Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыклапедыі», у якіх апісаў мясцовасці многіх бел. паветаў. На бел. мову перакладаў творы А.Міцкевіча, Ю.Супінскага, А.Мальчэўскага. Рукапісныя і кніжныя зборы Е. знаходзяцца ў Кракаве, Варшаве, часткова ў Мінску і Вільнюсе.

Літ.: Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX ст. Мн., 1969; Яго ж. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974; Пачынальнікі. Мн., 1977. *А.В.Мальдзіс.*

Е́ЛЬСКІ Казімір (4.3.1782, в. Дудзічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — сак. 1867), бел. скульптар. З роду *Ельскіх*. Вучыўся ў Віленскім ун-це (1801—08), Пецярбургскай АМ (1810). У 1811—26 узначальваў кафедру скульптуры на ф-це жывапісу, скульптуры і архітэктуры Віленскага ун-та. Першы прафесар скульптуры на Беларусі. Працаваў у галіне станковай і манум. скульптуры. Кіраваўся прынцыпамі класіцызму. Сярод работ: партрэты маршалка Віленскай губ. М.Ромера (1857) і яго жонкі Р.Ромер, бюсты вучоных Л.Баянуса, З.Нямцэўскага (паміж 1810 і 1820), мастакоў Ф.Смуглевіча, Я.Рустэма, кн. А.Чартарыйскага, барэльефы «Алегорыя скульптуры» (1858), «Смерць Барбары Радзівіл», «Трыумф Аляксандра II у гонар Парыжскага кангрэса 1856 г.». Стварыў статуі ў бакавых парталах Віленскага кафедральнага сабора, шэраг барэльефаў і бюстаў для Віленскага ун-та, паркавыя скульптуры. Аўтар мастацтвазнаўчых прац, у т.л. трактата «Аб сувязі архітэктуры, скульптуры і жывапісу» (1828).

Да арт. **Ельскія.** Казімір Ельскі. Бюст Захарыя Нямчэўскага. Паміж 1810 і 1820.

Літ.: Картинная галерея: Пер. с лит. Вильнюс, 1969.

Е́ЛЬСКІ Канстанцін Міхайлавіч (17.2.1837, в. Ляды Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 26.11.1896), бел. вучоны-біёлаг, географ, геолаг і падарожнік. З роду *Ельскіх*. Скончыў Кіеўскі ун-т (1860). Адзін з першых у Расіі прыхільнікаў эвалюц. тэорыі Ч.Дарвіна. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1863—64 на Украіне, у 1863 эмігрыраваў за мяжу. З 1865 у Франц. Гвіяне, з 1869 у Перу, вывучаў фауну гэтых краін. Удзельнічаў у стварэнні (1875) і дзейнасці (да 1879 хавальнік) прыродазнаўчага музея ў Ліме. Адкрыў новы від жывёлы Dinonys. Удасканаліў спосаб захоўвання насякомых, дасылаў сабраныя калекцыі насякомых, раслін, чучалы птушак, у музеі Еўропы. Як заолаг і геолаг працаваў у Турцыі, Германіі, Францыі. З 1880 у Кракаве: хавальнік прыродазнаўчых калекцый АН. У гонар вучонага названы адзін від лаўра — Ocotea Jelscii і некат. віды птушак і звяроў. Аўтар даследавання «Аб узаемнай залежнасці геалагічных з'яў» і кнігі «Папулярна-прыродазнаўчыя апавяданні пра знаходжанне ў Французскай Гвіяне і часткова ў Перу» (1898).

Літ.: Грицкевич В.П. Путешествия наших земляков. Мн., 1968; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX ст. Мн., 1969.

М.К.Багадзяж.

Е́ЛЬСКІ Міхаіл Карлавіч (8.10.1831, в. Дудзічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — студз. 1904), бел. скрыпач, кампазітар, муз. пісьменнік. Брат А.К.*Ельскага*. Ігры на скрыпцы вучыўся ў К.*Кжыжаноўскага* ў Мінску, В.Банькевіча ў Вільні, удасканальваўся ў А.*В'ётана* ў Парыжы, К.*Ліпінскага* ў Дрэздэне. З пач. 1860-х г. канцэртаваў у Польшчы і Германіі. Меў вял. рэпертуар, найб. блізкія яму былі творы Дж.Б.Віёці, В'ётана, Ліпінскага, Л.Шпора. Аўтар каля 100 твораў, у т.л. 2 канцэртаў, Санаты-фантазіі, фантазіі «Вясна», Бліскучай фантазіі на арыгінальныя тэмы, Фантазіі на тэмы польск. нар. мелодый для скрыпкі, скрыпічных і фп. паланэзаў, мазурак, мініяцюр («Скрыпічныя мініяцюры» апубл. ў 1852 у Кіеве). Выступаў як муз. публіцыст, друкаваў у польск. час. «Ruch muzyczny» («Музычны рух»), «Echo muzyczne» («Музычнае рэха») і інш. артыкулы і нарысы пра кампазітараў і музыкантаў-выканаўцаў (у т.л. бел. Ю.Дашчынскага, Кжыжаноўскага, К.Стравінскага і інш.). Збіраў і запісваў бел. нар. мелодыі, выкарыстоўваў іх у сваіх творах. Аўтар працы «Народныя танцы Мінскай губерні» (у рукапісе).

Літ. тв.: Kilka wspomnień z przeszłości muzycznej Litwy // Echo muzyczne. 1881. № 22—23.

Літ.: Дамінікоўскі Ф. Кампазітар і скрыпач М.Ельскі // Беларусь. 1946. № 8; Капилов А. Скрипач из Дудичей // Неман. 1978. № 5. *А.Л.Капілаў.*

Е́ЛЬСКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Адкрыты ў 1966 у г. Ельск Гомельскай вобл. як музей нар. славы, з 1976 краязнаўчы. Пл. экспазіцыі 103 м^2, каля 3 тыс. адзінак асн. фонду (1997). Сярод экспанатаў дакументы і матэрыялы пра падзеі рэвалюцыі 1905—09, грамадз.

вайны 1919—21, этнагр. калекцыі, прадметы побыту сялян канца 19 — пач. 20 ст., нар. касцюмы, посцілкі, карціны самадз. мастака М.Засінца. У экспазіцыі, прысвечанай Вял. Айч. вайне, матэрыялы пра абарончыя баі ў раёне, дзейнасць *Ельскага патрыятычнага падполля, Ельскую аперацыю 1943*, пра партызана славака *Я.Налепку*, пра злачынствы фашыстаў на тэр. раёна, карта-схема вызвалення Ельска ад нямфаш. захопнікаў. Адлюстравана аднаўленне і развіццё нар. гаспадаркі і культуры ў пасляваен. перыяд. *В.С.Антропава.*

ЕЛЬСКІ РАЁН, на Пд Гомельскай вобл. Утвораны 17.7.1924 як Каралінскі р-н, перайменаваны (1931) у Ельскі (у сучасных межах з 1965). Пл. 1,4 тыс. км². Нас. 23,6 тыс. чал. (1997), гарадскога 51,7%. Сярэдняя шчыльнасць 17,3



чал. на 1 км². Цэнтр раёна — г. *Ельск*, 70 сельскіх нас. пунктаў. Падзяляецца на 9 сельсаветаў: Багуціцкі, Валаўскі, Засінцаўскі, Качышчанскі, Млыноцкі, Рамязоўскі, Роза-Люксембургскі, Скараднянскі, Старавысокаўскі. Раён моцна пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС (1986). Поўнасцю адселена 5 нас. пунктаў (1996), у зоне з правам адсялення знаходзяцца 46 нас. пунктаў, дзе пражывае 18,8 тыс. чал.

Тэр. раёна пераважна ў межах *Мазырскага Палесся*, цэнтр. і паўд.-ўсх. ч. ў межах *Гомельскага Палесся*. Паверхня пласкахвалістая. 75% тэр. раёна на выш. 130—140 м, 25% — 140—160 м. Найвыш. пункт 177,8 м на Пд раёна (урочышча Ямны). Карысныя выкапні: торф, гліны для грубай керамікі, пясок, нафтавыя праяўленні, мінер. крыніца. У Е.р. ў 1952 упершыню на Беларусі атрымана са свідравіны нафта (18 т). Сярэдняя т-ра студз. -6,2 °С, ліп. 18,7 °С. Ападкаў 590 мм за год. Вегетац. перыяд 197 сут. У паўд. ч. раёна працякае р. Славечна з прытокамі Чэрцень, Батыўля, Ясенец, Жалонь, на ПнУ — Мытва з прытокам Млынок. Меліярац. каналы: Белякоўскі, Воўне, Высокі, Высока-Махнавіцкі, Валаўскі, Зашыр'еўскі і інш. 10 вадасх., найб. Кочышча, Бабруйкаўскае, Княжабор'еўскае. Пераважаюць глебы (79,3%) дзярнова-падзолістыя забалочаныя і тарфяна-балотныя. Пад лесам 53% тэрыторыі. Найб. лясістасць на ПдЗ, лясы хваёвыя і бярозавыя. Балоты пераважна нізінныя, займаюць 16,9% тэр., усе асушаны. Найб. балотныя масівы: Гала, Перасечанае балота.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 45,4 тыс. га, з іх асушаных 27,6 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 9 калгасаў, 6 саўгасаў, 6 фермерскіх гаспадарак. Асн. галіна сельскай гаспадаркі — мяса-малочная жывёлагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу. Прадпрыемствы дрэваапр. (мэблевая ф-ка), буд. (жалезабетонныя вырабы, цэгла, піламатэрыялы і інш.) і харч. прам-сці. Леспрамгас. Лясгас.

Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтадарога Калінкавічы—Оўруч (Украіна), нафтаправод «Дружба». Раённы цэнтр звязаны аўтадарогамі з г. Нароўля і г.п. Лельчыцы. У раёне 13 сярэдніх, 3 базавыя, 3 пачатковыя, 2 муз. школы, школа-інтэрнат, міжшкольны вытв.-вучэбны камбінат, 18 дашкольных устаноў, 38 клубаў і дамоў культуры, 26 б-к, 3 бальніцы, 20 фельч.-ак. пунктаў. Помнік архітэктуры — царква (18 ст.) у г. Ельск. Выдаецца газ. «Народны голас». *Г.С.Смалякоў.*

ЕЛЬСКІЯ, дзярж. і культ. дзеячы ВКЛ, Рэчы Паспалітай герба «Пелеш». Вядомы з канца 16 ст., асн. маёнткі мелі на Піншчыне і Міншчыне. Найб. вядомыя:

Францішак (1738—23.3.1821), скарбнік, падстолі гродзенскі (1777), падкаморы старадубскі (1780). На сеймах 1778 і 1780 выбіраўся скарбовым камісарам ВКЛ. Маршалак Трыбунала ВКЛ (1783). Пасол на *Чатырохгадовы сейм 1788—92.* У час *паўстання 1794* чл. *Цэнтральнай дэпутацыі Вялікага княства Літоўскага.* Чл. *Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага 1812.* Станіслаў (?—3.1.1829), камісар скарбовы ВКЛ (1784—92) і Рэчы Паспалітай (1792—93), маршалак Ігуменскага пав. (1795—1812). Канстанцін (?—21.10.1799), шамбялян (камергер) караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Пасол на Чатырохгадовы сейм 1788—92. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1794, прызначаны Т.Касцюшкам ген.-м. Гродзенскага пав. Пасля задушэння паўстання ў падполлі. Людвік (1785—8.8.1843). У званні маёра ўдзельнічаў у Маскоўскай кампаніі 1812 Напалеона. З 1823 у Варшаве, прэзідэнт Польск. банка (1828). У час *паўстання 1830—31* нам. міністра скарбу. Кароль (? — 1824), скульптар. Бацька Казіміра Ельскага. Пачынаў як лепшчык у 1778—82 з арх. К.Спампані, працаваў пераважна ў Вільні. Упрыгожыў маёнтак Д.Пшаздзецкага ў Заслаўі, аўтар помнікаў Спампані ў Царперскім манастыры пад Клецкам і М.Завішы ў капліцы ў Кухцічах (Уздзенскі р-н), скульптур Алены, Казіміра і Станіслава для Віленскага кафедральнага сабора. Для касцёла бернардзінцаў у Троках (Літва) зрабіў фігуры 4 евангелістаў, анёлаў і абраз св. Тройцы. Ян (1780—?), скульптар. Сын Караля. Выканаў фігуры прарокаў Іерамія і Ісаі (1804) для гал. алтара касцёла Пятра і Паўла ў Вільні. Па прыватных заказах Дамініка Радзівіла зрабіў 10 разных рам для партрэтаў у Нясвіжскім замку і інш. Гл. таксама *Ельскі* М.К., *Ельскі* А.К., *Ельскі* К.М.

ЕЛЬЦЫН Барыс Мікалаевіч (н. 1.2.1931, с. Бутка Таліцкага р-на Свярдлоўскай вобл., Расія), расійскі паліт. і дзярж. дзеяч. Скончыў Уральскі політэхн. ін-т (Свярдлоўск, 1955). З 1955 працаваў у буд. арг-цыях, з 1963 гал. інжынер, дырэктар Свярдлоўскага домабуд. камбіната. У 1968—88 на парт. рабоце: з 1976 1-ы сакратар Свярдлоўскага абкома, з 1985 сакратар ЦК КПСС, 1-ы сакратар Маскоўскага гаркома КПСС, з 1986 канд. у чл. Палітбюро ЦК КПСС. З 1987 1-ы нам. старшыні Дзяржбуда СССР — міністр СССР. З 1989 нар. дэпутат СССР. У 1990 выйшаў з КПСС. У 1990—91 старшыня Вярх. Савета РСФСР. З чэрв. 1991 пер-

Б.М.Ельцын.

шы Прэзідэнт Рас. Федэрацыі (выбраны 12.6.1991; 3.7.1996 выбраны на другі тэрмін). У снеж. 1991 разам з кіраўнікамі Беларусі і Украіны падпісаў Белавежскія пагадненні, быў адным са стваральнікаў *Садружнасці Незалежных Дзяржаў.* Ініцыятар пачатай у студз. 1992 радыкальнай эканам. рэформы. У адпаведнасці з яго ўказам «Аб паэтапнай канстытуцыйнай рэформе ў Рас. Федэрацыі» (вер. 1993) ліквідавана сістэма Саветаў. У снеж. 1993 прынята новая Канстытуцыя Рас. Федэрацыі і выбраны парламент — Федэральны Сход Рас. Федэрацыі. 2.4.1996 Е. і Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка падпісалі Дагавор аб Супольніцтве Беларусі і Расіі, 2.4.1997 — Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі.

Тв.: Записки президента. М., 1994; Бел. пер. — Споведзь на зададзеную тэму. Мн., 1991.

ЕЛЬЯШЭ́ВІЧ Міхаіл Аляксандравіч (21.8.1908, г. Мюнхен, Германія — 4.1.1996), бел. фізік, адзін з заснавальнікаў спектраскапіі атамаў і малекул. Акад. АН Беларусі (1956), д-р фізіка-матэм. н. (1945), праф. (1948). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыў Ленінградскі ун-т (1930). З 1956 у Ін-це фізікі АН Беларусі, з 1968 у БДУ, з 1990 у Акад. навук. комплексе «Ін-т цепла- і масаабмену» АН Беларусі. Навук. працы па атамнай і малекулярнай спектраскапіі, фізіцы плазмы. Распрацаваў асновы тэорыі ваганняў і вагальных спектраў шмататамных малекул, правёў шэраг даследаванняў па спектраскапіі рэдказямельных злучэнняў і спектраскапіі нізкатэмпературнай плазмы. Аў-

тар работ па гісторыі квантавай фізікі. Ленінская прэмія 1966; Дзярж. прэміі СССР 1949, 1950; Дзярж. прэмія Беларусі 1992.

Тв.: Атомная и молекулярная спектроскопия. М., 1962; Колебания молекул. 2 изд. М., 1972 (у сааўт.); От возникновения квантовых представлений до становления квантовой механики // Успехи физ. наук. 1977. Т. 122, вып. 4.

Літ.: М.А.Ельяшэвіч // Весці АН БССР. Сер. фіз.-матэм. навук. 1988. № 4.

Г.С.Раманаў.

ЕМЯЛЬЯ́НАЎ Аляксандр Міхайлавіч (н. 20.3.1952, в. Забалацце Чавускага р-на Магілёўскай вобл.), бел. паэт. Вучыўся ў БСГА (1969—71), скончыў БДУ (1983). Працаваў у прэсе (1973—83), на Бел. тэлебачанні (1983—87). Друкуецца з 1968. Асн. матывы паэзіі — жыццё сучасніка, любоў да Радзімы, роднай мовы, прыроды, праблемы гар. і сял. побыту (зб-кі «Ранак поўніцца жыццём», 1977, «Нязжатае поле», 1982, «На падкове дарог», 1987).



М.А.**Ельяшэвіч**.

В.Н.**Емяльянаў**.

ЕМЯЛЬЯ́НАЎ Віктар Ніканавіч (12.12.1926, г. Вінніца, Украіна — 12.5.1990), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1985). Скончыў Маскоўскі арх. ін-т (1956). З 1956 працаваў у БелНДІдзіпрасельбудзе (у 1986—89 гал. архітэктар). Асн. работы: праекты планіроўкі і забудовы вёсак *Аснежыцы* Пінскага, *Пліса* Смалявіцкага, *Сноў* Нясвіжскага (усе 1968), *Верцялішкі* Гродзенскага (1969, Дзярж. прэмія СССР 1971), Зашыр'е Ельскага (1970), Леніна Горацкага (1971), Мышкавічы Кіраўскага (1972), Крупіца Мінскага р-наў (1979, усе ў сааўт.) і інш.

Тв.: Вертелишки. М., 1974 (разам з М.Г.Дзіваковым); Современные направления в развитии белорусского села (разам з Н.М.Нядзелька) // Стр-во и архитектура Белоруссии. 1980. № 3; Архитектурно-планировочная организация сельских населенных мест Белоруссии. Мн., 1984.

ЕМЯЛЬЯ́НАЎ Леанід Рыгоравіч (н. 18.11.1937, в. Верціхова Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі раслін. Д-р біял. н. (1990). Скончыў БСГА (1961). З 1990 у Ін-це эксперым. батанікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па фізіялогіі ўстойлівасці раслін (збожжавыя злакі) да водна-цеплавых неспрыяльных уздзеянняў, механізмах рэгуляцыі іх воднага гамеастазу.

Тв.: Растения и вода. Мн., 1977; Влагообеспечение растений на торфяной почве: (Физиол. аспекты). Мн., 1980; Водообмен и стресс-устойчивость растений. Мн., 1992 (разам з С.А.Анкуд).

ЕМЯЛЬЯ́НАЎ Мікалай Генадзевіч (н. 11.3.1947, г. Ніжні Ноўгарад, Расія), рускі і бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1988). Скончыў Ніжагародскае тэатр. вучылішча (1972). Да 1979 у Пензенскім, з 1979 у Гродзенскім абл. драм. т-ры. Яго мастацтва адметнае тонкай псіхал. распрацоўкай характараў, спалучэннем эмацыянальнага стану героя са знешне стрыманай манерай выканання. Сярод роляў: Лапахін («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Мастакоў («Стары» М.Горкага), Галядкін («Двайнік», паводле Ф.Дастаеўскага), Маляр («Дзікі Анёл» Л.Каламійца), Марк («Вечна жывыя» В.Розава), Рамахін («Заўтра была вайна» паводле Б.Васільева), Мікалай II («Змова» А.М.Талстога і П.Шчогалева).

ЕМЯЛЬЯ́НАЎ Несцер Пятровіч (11.11.1898, в. Ляцягі Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. — 29.9.1970), бел. хімік. Д-р хім. н. (1970). Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1932). З 1959 у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН БССР. Навук. працы па распрацоўцы метадаў атрымання α, β-ненасычаных кетонаў, спіртоў, дыкарбонавых кіслот, мона- і спалучаных дыалефінаў, паліёлаў і іх вытворных на аснове гідрапераксідаў вуглевадародаў цыклічнай структуры.

ЕН, у комі міфалогіі бог, стваральнік усяго добрага для народа, рамеснік, майстар. Супрацьстаіць брату Омалю, які творыць толькі дрэннае і злое.

ЕН (Jähn) Зігмунд (н. 13.2.1937, в. Раўтэнкранц, Германія), першы касманаўт Германіі. Герой ГДР (1978), Герой Сав. Саюза (1978), лётчык-касманаўт ГДР (1978). Скончыў Вышэйшае афіцэрскае вучылішча ППА ВПС імя Ф.Мерынга (1958), Ваенна-паветр. акадэмію імя Ю.А.Гагарына (1970). З 1976 у атрадзе касманаўтаў. 26.8—3.9.1978 разам з В.Ф.*Быкоўскім* здзейсніў палёт (як касманаўт-даследчык) на касм. караблі «Саюз-31» і арбітальным комплексе «Салют-6»—«Саюз-29» (асн. экіпаж У.В.*Кавалёнак*, А.С.*Іванчэнкаў*). Правёў у космасе 7,9 сут.

ЕНГІБА́РАЎ Леанід Георгіевіч (15.3.1935, Масква — 25.7.1972), расійскі артыст цырка, клоун-мім. Нар. арт. Арменіі (1971). Скончыў вучылішча цыркавога мастацтва ў Маскве (1959). Вобраз-маска артыста — летуценны блазан, дзіця і паэт у душы. Выступаў на эстрадзе з «Вечарамі пантамімы», распрацоўваў ідэю «аўтарскай клаунады». Аўтар сваіх нумароў, кінасцэнарыяў, кароткіх навел і прытчаў. Здымаўся ў кіно: «Шлях на арэну», «Цені забытых продкаў», «На манежы — юнацтва», «Знаёмцеся — Леанід Енгібараў» і інш.

ЕНДРЫХО́ЎСКІ (Jędrychowski) Стэфан (н. 19.5.1910, Варшава), польскі дзярж. дзеяч, удзельнік рэв. руху ў Зах. Беларусі. Скончыў Віленскі ун-т. Д-р права. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Студэнцкай лявіцы «*Фронт*» у Віленскім ун-це, якая знаходзілася пад уплывам КПЗБ і КПП, рэдактар (разам з Г.*Дэмбінскім*) і супрацоўнік яе двухтыднёвіка «Poprostu» («Папросту»), газ. «Karta» («Карта») у 1935—36. Удзельнік *антыфашысцкага кангрэса дзеячаў культуры 1936* у Львове. У 1937 асуджаны на 4 гады. З 1939 у СССР. У Вял. Айч. вайну адзін з арганізатараў *Саюза польскіх патрыётаў у СССР* і 1-й дывізіі імя Т.Касцюшкі. З 1944 працаваў у Польскім к-це нац. вызвалення. З 1945 у складзе ўрада ПНР, у 1968—74 міністр замежных спраў, фінансаў.

ЕНІКАЛО́ПАЎ Мікалай Сяргеевіч (13.3.1924, г. Сцепанакерт, Азербайджан — 22.1.1993), савецкі фізікахімік. Акад. АН СССР (1976, чл.-кар. з 1966). Скончыў Ерэванскі політэхн. ін-т (1945). У 1949—80 у Ін-це хім. фізікі, з 1985 дырэктар Ін-та сінт. палімерных матэрыялаў АН СССР, адначасова (з 1961) праф. Маскоўскага фізіка-тэхн.

З.**Ен**

М.С.**Енікалопаў**.

ін-та. Навук. працы па кінетыцы і механізме іоннай полімерызацыі, тэхналогіі палімерных кампазіцыйных матэрыялаў. Адкрыў новы элементарны акт полімерызацыі — перадачу ланцуга праз палімер (1961), магчымасць полімерызацыі пры высокім ціску ў спалучэнні з дэфармацыяй зруху рэчываў, якія цяжка ператварыць у палімеры інш. метадамі. Прапанаваў метады напаўнення тэрмапластаў мінер. напаўняльнікамі непасрэдна ў ходзе полімерызацыі. Ленінская прэмія 1980.

Літ.: Н.С.Ениколопов, 1924—1993. М., 1994.

ЕНІСЕ́Й (па-эвенкійску І а а н э с і літар. вялікая вада, рака), рака ў Сібіры, у Краснаярскім краі (вярхоўі ў Рэспубліцы Тува), Расія. Адна з самых вялікіх рэк на зямным шары (7-е месца). Утвараецца пры зліцці *Вялікага Енісея* (Бій-Хем) і *Малога Енісея* (Ка-Хем) каля г. Кызыл. Даўж. 3487 км (ад вытокаў Малога Е. 4102 км), пл. бас. 2580 тыс. км^2. Упадае ў Енісейскі зал. Карскага м.

Цячэнне Е. падзяляецца на 3 ч.: верхняе (ад зліцця Бій-Хема і Ка-Хема да ўпадзення р. Абакан), сярэдняе (паміж рэкамі Абакан і Ангара), ніжняе (ад р. Ангара да вусця). У вярхоўі Е. цячэ па ўзгорыстым стэпе Тувінскай катлавіны пад назвай Верхні Е. (Улуг-Хем). Рэчышча падзелена на асобныя рукавы

і пратокі, спакойныя плёсы чаргуюцца з перакатамі. Ад упадзення р. Хемчык на працягу 280 км Е. праразае хрыбты Зах. Саяна. Даліна тут вузкая, месцамі каньёнападобная, шыр. да 100 м. У рэчышчы шмат камяністых перакатаў і парогаў. Пры выхадзе Е. ў Мінусінскую катлавіну даліна расшыраецца, шмат астравоў. Паміж гарадамі Мінусінск і Краснаярск у адгор'ях Усх. Саяна даліна звужаецца, ніжэй Краснаярска даліна расшыраецца пасля ўпадзення р. Ангара, левы бераг нізінны, правы ўзвышаны. Пры перасячэнні адгор'яў Енісейскага кража Е. утварае Казачынскі і Асінаўскі парогі. Ніжэй г. Дудзінка цячэ па Паўн.-Сібірскай нізіне. У нізоўях разбіваецца на рукавы: шырыня рэчышча да 15—20 км, глыб. больш за 15 м. Асн. прытокі: Оя, Туба, Мана, Кан, Ангара, Падкаменная Тунгуска, Ніжняя Тунгуска, Курэйка (справа), Абакан, Сым, Турухан (злева). Жыўленне снегавое, дажджавое і грунтавое. Для б.ч. Е. характэрна высокае веснавое разводдзе і ўстойлівая асенне-зімовая межань, частыя летнія дажджавыя паводкі, у вярхоўях — вяснова-летняе разводдзе. Ледастаў у ніжнім цячэнні з канца кастр. да канца мая — пач. чэрв.; у сярэднім цячэнні з пач. ліст. да канца крас. — сярэдзіны мая; у горнай ч. з канца ліст. — снеж. да канца красавіка. Е. — самая многаводная рака Расіі. Сярэднегадавы расход вады ў вусці г. Ігарка 18 100 м³/с, у вусці — 19 800 м³/с.

Енісей каля г. Краснаярск.

На Е. Саяна-Шушанская, Майнская і Краснаярская ГЭС з вадасховішчамі. Суднаходства на вадасховішчах і ад г. Краснаярск да вусця. Для праводкі суднаў з ніжняга б'ефа ў Краснаярскае вадасховішча і назад пабудаваны суднападʼёмнік. Да г. Ігарка (973 км ад вусця) паднімаюцца марскія судны. Рыбныя промыслы (асетр, сцерлядзь, омуль, селядзец, нельма, бялуга і інш.). У бас. Е. запаведнікі Саяна-Шушанскі і Слупы. Гал. гарады і парты: Кызыл, Саянагорск, Мінусінск, Абакан, Дзіўнагорск, Краснаярск, Енісейск, Ігарка, Дудзінка.

Літ.: Гнедовский Б.В., Добровольская Э.Д. Вверх по Енисею. М., 1980; Колесов А.Н. По Енисею. 3 изд. Красноярск, 1990. *В.П.Кісель.*

ЕНІСЕ́ЙСКІ ЗАЛІ́Ў, заліў у Карскім м., паміж Гыданскім п-вам і п-вам Таймыр. Даўж. каля 225 км, шыр. каля ўваходу 150 км, глыб. 6—20 м. Упадае р. Енісей. Свабодны ад лёду 3 летнія месяцы. Прылівы паўсутачныя (да 0,4 м). Рыбалоўства (нельма, омуль), промысел цюленя, бялухі. На ўсх. беразе каля ўваходу ў Е.з. порт Дыксан.

ЕНІСЕ́ЙСКІ КРАЖ, прыўзняты паўд.-зах. край *Сярэднесібірскага пласкагор'я*, у Краснаярскім краі Расіі. Распасціраецца на 700 км ад даліны р. Кан на ПнЗ па правабярэжжы р. Енісей, з якім перасякаецца, утвараючы Асінаўскі парог. Выш. да 1104 м (г. Енашымскі Палкан). Складзены з гнейсаў, крышт. сланцаў і вапнякоў, прарваных інтрузіямі гранітаў. На схілах цемнахвойная тайга з перавагай піхты. Радовішчы золата, жал. руды, баксітаў, магнезіту, тальку і інш.

ЕНСЕН (Jensen) Іаганес Вільгельм (20.1.1873, г. Фарсё, Данія — 25.11.1950), дацкі пісьменнік. Вучыўся ў Капенгагенскім ун-це (1893—95). Аўтар раманаў сац.-псіхалагічных «Датчане» (1896), «Эйнар Элькер» (1898), гіст. «Падзенне караля» (ч. 1—3, 1900—01); «Спакушэнне доктара Рэно» (1935), «Гудрун» (1936), эпапеі «Доўгі шлях» (кн. 1—6, 1908—22) — своеасаблівай карціны грамадскага развіцця чалавецтва і даледавіковага перыяду да 16 ст. Выдаў зб-кі апавяданняў «Хімерландскія гісторыі» (кн. 1—3, 1898—1910), лірыка-філас. мініяцюр «Міфы» (кн. 1—9, 1907—44), «Ютландскі вецер» (1931), паэт. зб-кі «Вершы» (1906), «Подры года» (1923), кнігі дарожных нататкаў, эсэ «Гатычны рэнесанс» (1901), «Свіфт і Эленшлегер» (1950). У творах Е. спалучаюцца рысы рэалізму і неарамантызму. Нобелеўская прэмія 1944.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—9. М., 1911—1912; Избранное. Л., 1989; Долгий путь. СПб., 1994. *Е.А.Лявонава.*

ЕНСЕН (Jensen) Іаганес Ганс Даніэль (25.6.1907, г. Гамбург, Германія — 11.2.1973), нямецкі фізік-тэарэтык. Чл. Гайдэльбергскай АН (1949). Скончыў Гамбургскі ун-т (1932), дзе і працаваў у 1937—41. З 1941 праф. Гановерскага тэхнал. ін-та, з 1949 — Гайдэльбергскага ун-та. Навук. працы па ядз. фізіцы і фіз. цвёрдага цела. Даследаваў узаемадзеянні іонаў у крышталях, атрымаў залежнасць поўнай энергіі крышталя ад міжатамнай адлегласці. Увёў паняцце спін-арбітальнай сувязі і распрацаваў абалонкавую мадэль атамнага ядра (1950). Нобелеўская прэмія 1963 (разам з М.*Гёперт-Маер*).

«ЕПАРХІА́ЛЬНЫЕ ВЕ́ДОМОСТИ», назва перыядычных выданняў, афіц. органаў *епархій*, якія выдаваліся з 2-й пал. 19 ст. да 1917 у Рас. імперыі, у т.л. на Беларусі. Мелі 2 часткі: афіцыйную і неафіцыйную. У першай друкаваліся ўрадавыя пастановы, указы і распараджэнні Сінода, царк. хроніка, у другой — матэрыялы па багаслоўі, л-ры, фальклоры, этнаграфіі, археалогіі, краязнаўстве, гісторыі царквы. Выдаваліся «Литовские епархиальные ведомости» (1863—1916, Вільня, Масква), «Минские епархиальные ведомости» (1869—1917, Мінск, Разань; адноўлена ў 1989 у Мінску), «Полоцкие епархиальные ведомости» (1874—1917, Віцебск), «Могилевские епархиальные ведомости» (1883—1917, Магілёў), «Гродненские епархиальные ведомости» (1901—15, Гродна).

ЕПА́РХІЯ (грэч. eparchia), царкоўна-адм. адзінка (вобласць, зямля, дзяржава), падведамасная *епіскапу*. Першапачаткова дзярж.-адм. адзінка ў Рымскай імперыі. Калі з 4 ст. царк.-адм. падзел стаў адпавядаць дзярж.-адм. падзелу імперыі, назва «Е.» пачала ўжывацца і хрысціянскай царквой. Складаецца з прыходаў (парафій). Назвы Е. звычайна супадалі з назвамі гарадоў, дзе размяшчаліся епіскапскія кафедры.

Е. на Беларусі ў праваслаўнай царкве на 1997: Брэсцкая (засн. ў 1942, адноўлена ў 1990), Віцебская (засн. ў 1942, адноўлена ў 1992), Гродзенская (засн. ў 1900, адноўлена ў 1992), Гомельская (засн. ў 1990), Магілёўская (засн. ў 1632, адноўлена ў 1989), Мінская (засн. ў 1793), Навагрудская [у 1316 Навагрудак стаў цэнтрам Кіеўскай (Літоўска-Навагрудскай) мітраполіі, у 1992 Е. адноўлена], Пінская (засн. ў 1241, адноўлена ў 1990), Полацкая (засн. ў 992, адноўлена ў 1989), Тураўская (засн. ў 1005, адноўлена ў 1992).

Е. на Беларусі ў рымска-каталіцкай царкве на 1997: Гродзенская (засн. ў 1991), Мінска-Магілёўская (Мінская засн. ў 1798, Магілёўская — у 1773, аб'яднаная Е. адноўлена ў 1991), Пінская апостальская адміністрацыя (засн. ў 1925, адноўлена ў 1991 з падпарадкаваннем Мінска-Магілёўскай Е.).

У грэка-каталіцкай царкве на тэр. Беларусі паміж 1595 і 1839 у розны час існавалі Е.: Кіеўская мітрапаліцкая (з рэзідэнцыяй мітрапалітаў у Вільні і Навагрудку, часам у Варшаве), Беларуская (Полацкая), Брэсцкая (Уладзімірска-Брэсцкая), Літоўская (Віленская), Смаленская, Турава-Пінская. У 1941—42 на акупіраванай тэр. Беларусі дзейнічаў Бел. грэка-каталіцкі экзархат з падпарадкаваннем мітрапаліту галіцкаму на Украіне, але сталая епархіяльная структура ў бел. уніятаў не склалася.

Літ.: Мартос А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. Мн., 1990.

ЕПАРХІЯ́ЛЬНЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ, сярэднія жаночыя навуч. ўстановы ў Рас. імперыі. Засн. паводле Статута 1843 пераважна для дачок праваслаўнага духавенства. Утрымліваліся на сродкі збораў

з цэркваў, свечачных з-даў і інш. Падпарадкоўваліся Сіноду. Навучальны курс (6 кл., з 1900 спец. дадатковы 7-ы пед. кл.) набліжаўся да курса жаночых гімназій. Выпускніцы атрымлівалі права хатніх настаўніц і настаўніц пач., пераважна сельскіх, школ (з 1884 — царкоўнапрыходскіх). Пры некаторых Е.в. існавалі пач. школы, у якіх выхаванкі старэйшых класаў праходзілі практыку. У Беларусі існавалі Е.в.: Спаса-Ефрасіннеўскае каля Полацка (з 1844), у Парычах (з 1860), Мінску і Магілёве (1863), Віцебску (1864). Ліквідаваны паводле пастановы СНК ад 24.12.1917.

ЕПІ́СКАП (грэч. episkopos літар. наглядальнік), 1) вышэйшы духоўны сан у праваслаўнай, каталіцкай, англіканскай і стараж.-ўсх. цэрквах. Кіраўнік царк.-адм. тэр. адзінкі — *епархіі* ці яго памочнік (*вікарый* у праваслаўі, суфраган у каталіцызме). Е. — кіраўнікі вялікіх епархій ці акругоў з некалькіх епархій могуць мець ганаровыя тытулы: *архіепіскап, мітрапаліт, экзарх, патрыярх* і інш. Паводле царк. дагматыкі Е. — носьбіт таінства свяшчэнства, толькі ён можа выконваць хіратонію (пасвячэнне) *дыяканаў* і *святароў*. Палажэнне аб Е. вызначаецца ў кожнай царкве адпаведнымі канонамі. Е. мае спец. знакі епіскапскай годнасці і асабліва адзенне. У яго тытул звычайна ўваходзіць назва горада, дзе знаходзіцца кафедра. Пасвячаюць у Е. пажыцёва, пазбаўляюць сану ў выключных выпадках. У шэрагу пратэстанцкіх аб'яднанняў, напр. лютэранстве, пяцідзесятнікаў і інш., некаторыя вышэйшыя асобы таксама наз. Е., але ў іх гэта пасада не мае сакральнага сэнсу. 2) У Стараж. Грэцыі паліт. агент, якога Афіны пасылалі ў саюзныя дзяржавы для нагляду за выкананнем імі саюзных дагавораў.

ЕПІСКАПА́Т, у каталіцтве сістэма царк. кіравання праз *епіскапаў*. Е. кожныя 5 гадоў павінны з'яўляцца ў Рым для справаздачы аб справах у *епархіі*. 2-гі Ватыканскі сабор (1962—65) заснаваў у якасці калегіяльных органаў кіравання нац. і рэгіянальныя канферэнцыі епіскапаў і Сінод епіскапаў пры папе.

ЕПІФА́НІЙ СЛАВІНЕ́ЦКІ, гл. *Славінецкі Епіфаній*.

ЕРАВЕ́НКА Валерый Аляксандравіч (н. 2.3.1950, г. Кіраў, Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н., праф. (1996). Скончыў БДУ (1972), дзе і працуе. Навук. працы па функцыян. аналізе, дыферэнц. ураўненнях, спектральнай тэорыі лінейных аператараў.

Тв.: О L^p-существенных спектрах некоторых классов несамосопряженных обыкновенных дифференциальных операторов. [Ч.] 1—2 / Дифференциальные уравнения. 1996. № 8—9.

ЕРАМЕ́ЕЎ Канстанцін Сцяпанавіч (літ. псеўд. Гудок, Гудок-Ерамееў і інш.; 6.6.1874, Мінск — 28.1.1931), савецкі парт. і ваен. дзеяч, журналіст. У с.-д. руху з 1896, неаднаразова арыштаваны, быў у эміграцыі. У 1910—15 у рэдакцыях газ. «Звезда», «Правда» і інш. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. Бюро ЦК РСДРП(б). У час Кастр. рэвалюцыі 1917 чл. Петраградскага ВРК. Са снеж. 1917 камандуючы войскамі Петраградскай ваен. акругі. Удзельнік грамадз. вайны. Адзін з арганізатараў Дзяржвыда, рэдактар «Рабочей газеты», час. «Крокодил» (1922—28) і інш. З 1924 чл. РВС СССР, з 1925 нач. Палітупраўлення Балт. флоту. Пазней на дыпламат. і выдавецкай рабоце. Аўтар прац пра Кастр. рэвалюцыю, грамадз. вайну. Чл. ЦКК РКП(б) у 1924—25. *Р.В.Булацкі.*

ЕРАНІ́М ПРА́ЖСКІ (Jeroným Pražský; каля 1378—30.5.1416), чэшскі рэліг. рэфарматар, вучоны, прамоўца; паплечнік *Я.Гуса*. Скончыў Пражскі ун-т (1398). У 1399 быў у Оксфардзе, дзе стаў прыхільнікам ідэй англ. рэфарматара *Дж.Уікліфа*. У 1405—06 выкладаў ва ун-тах Парыжа, Гайдэльберга, Кёльна.

Еранім Пражскі. Гравюра па сталі.

У 1406 зблізіўся з Гусам. Шмат падарожнічаў, выступаў з пропаведзямі, у якіх выкрываў злоўжыванні каталіцкага духавенства, ням. засілле ў Чэхіі. У 1413 запрошаны ў Кракаў, пазней пры двары вял. кн. літ. Вітаўта ў Вільні, разам з ім наведаў Віцебск і Пскоў з мэтай арганізаваць барацьбу супраць рым. курыі. Паводле пісьма кракаўскага епіскапа Е.П. быў у ВКЛ нядоўга, але выклікаў такое хваляванне ў духавенстве і народзе, якога не ведалі ў гэтых краях. Спадзеючыся выратаваць Гуса, у крас. 1415 прыехаў у Канстанцу на царк. сабор. Асуджаны саборам як ерэтык і спалены.

ЕРА́СЬ (ад грэч. hairesis, асобнае вераўчэнне, школа, секта), адыход ад афіц. царк. дактрыны па пытаннях дагматыкі, культу і арганізацыі. Ідэйнымі вытокамі Е. былі *іудаізм* і іудзейскае сектанцтва (эсены, эбіяніты, неаплатонікі), якія ўплывалі пазней на *антытрынітарыяў*, хіліястаў, арыян (гл. *Хіліязм, Арыянства*), а таксама *язычніцтва* і *містыцызм* у выглядзе *гнастыцызму, маніхейства*, ісіхазму і інш. На глебе незадаволенасці палітыкай Ватыкана ў 14—16 ст. узнік шэраг сял. рухаў, якія зліваліся з рэфармац. рухам (гл. *Рэфармацыя*).

На Беларусі ўсе Е. прыўнесены з-за мяжы: у 15 ст. *гусізм*; у 16 ст. рэліг.-рацыяналіст. вучэнне (Ф.Касой, *Арцемій*, М.Башкін), антытрынітарыі, атэісты (К.*Бекеш*, С.*Лован*), з 17 ст. *сацыніяне*.

А.А.Шітавец.

ЕРАТЫ́К (грэч. hairetikos), чалавек, які адступіў ад догмаў пануючай царквы; паслядоўнік *ерасі*.

ЕРАФЕ́ЕНКА Віктар Ціханавіч (н. 14.9.1946, г. Ганцавічы Брэсцкай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1993), праф. (1996). Скончыў Маскоўскі дзярж. ун-т (1969). З 1972 у БДУ. Навук. працы па матэм. фізіцы, краявых задачах электрадынамікі, матэм. мадэляванні. Распрацаваў аналіт. метады і тэорыю ўсярэдненых гранічных умоў для эл.-магн. палёў на тонкіх абалонках, тэарэмы складання для базісных эл.-магн. хваль.

Тв.: Электромагнитные поля в экранирующих оболочках. Мн., 1988 (разам з С.М.Апалонскім); Теоремы сложения: Справ. Мн., 1989. *П.М.Бараноўскі.*

ЕРАФЕ́ЕЎ Барыс Васілевіч (10.5.1909, в. Пендзелка Пензенскай вобл., Расія — 24.11.1995), бел. фізікахімік. Акад. АН Беларусі (1947, чл.-кар. 1940); д-р хім. н. (1940), праф. (1941). Засл. дз. нав. Беларусі (1979). Скончыў Маскоўскі ун-т (1930). У 1939—41 і 1952—58 дырэктар Ін-та хіміі, з 1959 першы дырэктар Ін-та фізіка-арган. хіміі, у 1953—56 віцэ-прэзідэнт АН БССР, адначасова (з 1951) праф. БДУ. У 1965—76 у Маскоўскім пед. ін-це, з 1976 у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН Беларусі. Навук. працы па хім. кінетыцы і каталізе, тапахіміі, фізікахіміі палімераў. Вывеў у матрычнай форме ўраўненне кінетыкі паслядоўных рэакцый першага парадку; тапакінетычныя ўраўненні (1950). Распрацаваў ліганда-палявую тэорыю гетэрагеннага каталізу, каталітычныя сістэмы для полімерызацыі алефінаў, антыблочную кампазіцыю для цэлафанавай вытв-сці. Прапанаваў і арганізаваў вытв-сць браняшкла для самалётаў (1943). Дзярж. прэмія СССР 1946.

Тв.: Кинетика гомогенного катализа. Мн., 1977 (разам з У.А.Тулупавым); Циклогекса-1,3—диен и продукты на его основе. Мн., 1980 (разам з С.Ф.Навумавай, В.Д.Юрынай).

Літ.: Б.В.Ерофеев: (к 80-летию со дня рождения): Биобиблиогр. указ. Мн., 1989.

ЕРАШО́Ў Анатоль Іванавіч (н. 30.4.1936, г. Гарадок Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне вет. вірусалогіі, мікрабіялогіі і радыебіялогіі. Д-р біял. н. (1992), праф. (1993). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1959). З 1972 у Бел. НДІ эксперым. ветэрынарыі імя С.М.Вышалескага, з 1986 у Малдаўскім НДІ жывёлагадоўлі і ветэрынарыі, з 1991 у Бел.

агр. тэхн. ун-це. Навук. працы па метадах і сродках дыягностыкі і прафілактыкі інфекц. хвароб с.-г. жывёлы.

Тв.: Диагностика и профилактика инфекционных заболеваний молодняка крупного рогатого скота. Кишинев, 1991 (разам з П.А.Красачка, Т.І.Паміркам); Экологическая безопасность на объектах агропромышленного комплекса. Мн., 1996 (разам з А.І.Антоненкавым, Л.В.Місунам).

ЕРАШО́Ў Іван Міхайлавіч (26.9.1911, г. Лепель Віцебскай вобл. — 8.5.1948), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Ста-

Б.В.**Ерафееў**.



І.М.**Ерашоў**.

лінградскае ваен. авіяц. вучылішча (1936), Ваен.-паветр. акадэмію (1943). У Чырв. Арміі з 1933. У Вял. Айч. вайну камандзір штурмавога авіяпалка маёр Е. — удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны. У 1943 зрабіў 94 баявыя вылеты. У час аднаго з баёў трапіў у палон, уцёк, прабраўся да сваіх. Страціў нагу, але лятаў на баявыя заданні.

ЕРАШЭ́НКА Віктар Іванавіч (9.3.1921, г. Еўпаторыя, Рэспубліка Крым, Украіна, — 6.12.1980), Герой Сав. Саюза (1945). Беларус. Скончыў Качынскую ваен. авіяц. школу (1938), Ваен.-паветр. акадэмію (1952). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну на Паўн.-Зах., Волхаўскім і 1-м Укр. франтах. Нам. камандзіра палка, інспектар-лётчык па тэхніцы пілатавання і тэорыі палётаў маёр Е. зрабіў 216 баявых вылетаў, з іх 87 на разведку тылоў праціўніка. Да 1961 у Сав. Арміі, да 1977 у грамадз. авіяцыі.

ЕРГАЛІ́ЕЎ Хамід (н. 27.10.1916, пас. Новабагацінскі Гур'еўскай вобл., Казахстан), казахскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Казахстана (1986). Вучыўся ў Казахскім ун-це (1939—41). Аўтар каля 30 паэт. зборнікаў. У кнігах вершаў і паэм «Споведзь бацькі» (1947), «Дзяўчына з нашага аула» (1950), «Твая рака» (1953), «Курмангазы» (1962), «Залатая чаша» (1981; Дзярж. прэмія Казахстана імя Абая 1982) адлюстраваў жыццё і побыт каз. народа ў розныя гіст. эпохі. Аўтар апавяданняў, нарысаў, публіцыстычных артыкулаў і інш. Творы Д. перакладзены на мовы народаў свету.

Ж.Сахіеў.

ЕРГЕНІ́, узвышша на ПдУ еўрапейскай ч. Расіі, у Валгаградскай, Растоўскай абласцях і Калмыкіі. Распасціраецца ад Волгі (у раёне г. Валгаград) да даліны р. Усх. Маныч. Даўж. каля 350 км, шыр. 20—50 км, выш. 160—221 м. Складзена з глін, вапнякоў і пясчанікаў. Усх. схіл стромка (да 70—80 м) абрываецца да Прыкаспійскай нізіны, расчлянёны густой сеткай яроў. Каля падножжа прэснаводныя Сарпінскія азёры. Зах. схіл спадзісты, паступова паніжаецца да даліны р. Дон. Пераважае паўпустынная расліннасць.

ЕРМАКО́ВА Людміла Уладзіміраўна (н. 5.7.1927, Масква), рускі харавы дырыжор. Нар. арт. Расіі (1981), нар. арт. СССР (1988). Скончыла Муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (1957). З 1957 хормайстар, з 1965 дырыжор, з 1983 маст. кіраўнік Вял. хору Дзяржтэлерадыё Расіі, у рэпертуары якога буйныя вак.-сімф., аратарыяльныя і хар. творы муз. класікі, сучасных кампазітараў, нар. песні, творы духоўнай музыкі. З 1963 выкладае ў Маск. кансерваторыі (з 1993 праф.).

ЕРМАКО́ВІЧЫ Філон і Елізар, бел. дойліды 17 ст. Жылі ў в. Грычына (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). З дойлідамі Ільёй і Антонам Зезгуламі і Маркам будавалі сядзібы і палацы Койданаўскага графства.

ЕРМАКО́Ў Васіль Пятровіч (11.3.1845, в. Церуха Гомельскага р-на — 16.3.1922), расійскі матэматык. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1884). Скончыў Кіеўскі ун-т (1868), дзе і працаваў (з 1877 праф.), з 1899 у Кіеўскім політэхн. ін-це. Навук. працы па матэм. аналізе, алгебры, тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, механіцы. Адкрыў новую прыкмету збежнасці бесканечных шэрагаў (1870), даў новы спосаб рашэння класічнай задачы аб брахістахроне (1900). Выдаваў «Журнал элементарной математики» (1884—86). Аўтар падручнікаў і навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

Літ.: Историко-математические исследования. М., 1956. Вып. 9. С. 667—722; Дабравольскі В.А. Да ісціны — найпрасцейшым шляхам: Васіль Ермакоў. Мн., 1992.

ЕРМАКО́Ў Віктар Яўсеевіч (н. 24.8.1928, в. Пожар Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне лесаўпарадкавання. Д-р с.-г. н. (1983), праф. (1986). Засл. лесавод Беларусі (1991). Акад. Украінскай лясной акадэміі (1993). Скончыў Бел. лесатэхн. ін-т (1952). З 1953 працуе ў Бел. тэхнал. ун-це (у 1977—90 заг. кафедры). Навук. працы па прадукцыйнасці і гасп. ацэнцы лясоў Беларусі з улікам умоў іх росту і ўзроставай дынамікі.

Тв.: Основы природопользования. Мн., 1980 (у сааўт.); Справочник таксатора. Мн., 1980 (разам з У.С.Мірошнікавым, А.А.Трулем); Справочник работника лесного хозяйства. Мн., 1986 (у сааўт.); Лесоустройство. 3 изд. Мн., 1993.

ЕРМАЛАВІЦКІ БОЙ 1943, аперацыя партызан 113-га камандзір К.М.Белавусаў), 121-га (А.М.Касаеў), 61-га (Р.К.Паўлаў) атрадаў па разгроме ням.-фаш. гарнізона ў в. Ермалавічы Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл. 28—29 кастр. ў Вял. Айч. вайну. Гарнізон быў вузлавым сярод тых, што забяспечвалі рух на шашы Магілёў—Бялынічы, ажыццяўляў карныя аперацыі супраць партызан і мірнага насельніцтва ў Бялыніцкім і Магілёўскім р-нах. Аперацыя распрацавана і праводзілася пад кіраўніцтвам Магілёўскай раённай ВАГ. Партызаны акружылі вёску і нечакана ўварваліся ў гарнізон, захапілі вял. колькасць боепрыпасаў, зброі, амуніцыі, знішчылі значную колькасць жывой сілы ворага.

ЕРМАЛА́ЕВА Вера Міхайлаўна (1893, г. Пятроўск Саратаўскай вобл., Расія — 1938), рускі і бел. мастак, педагог. Вучылася ў маст. школе М.Д.Бернштэйна (1911—14) і археал. ін-це у Пецярбургу (1914—17), а таксама ў Францыі, Швейцарыі і Англіі. Чл. аб'яднання мастакоў «Саюз моладзі», стварыла (1918) арцель мастакоў «Сёння» ў Пецярбургу. Працавала ў музеі горада (цяпер Музей гісторыі Пецярбурга) і кале-

В.**Ермалаева**. Эскіз афармлення сцэны для футурыстычнай оперы «Перамога над сонцам». 1920.

гіі Аддзела выяўл. мастацтва Наркамасветы. У 1919—22 выкладчык, кіраўнік майстэрні і рэктар Віцебскага нар. маст. вучылішча. Чл. групы «*Сцвярджальнікі новага мастацтва*». Удзельнічала ў агітацыйна-маст. афармленні Віцебска, па яе эскізах створаны дэкарацыі і касцюмы для губ. т-ра (футурыстычная опера «Перамога над сонцам», 1920). З 1922 у Пецярбургу, у Ін-це маст. культуры (1923—27) пад кіраўніцтвам К.Малевіча, уплыў якога зазнала. Афармляла і ілюстравала дзіцячыя кнігі М.Асеева, М.Венгерава, І.Крылова (усе 1920-я г.), І.В.Гётэ, М.Сервантэса, М.Чарнышэўскага (усе 1930-я г.), стварыла шэраг кніжак-карцінак. Сярод станковых работ «Галгофа» (1928), «Дрэвы», «Хлопчыкі», аўтапартрэт (усе пач. 1930-х г.) і інш. Рэпрэсіравана ў 1934.

Літ.: Ковтун Е. Художница книги В.М.Ермолаева // Искусство книги: Сб. М., 1975. Вып. 8; Авангард, остановленный на бегу: [Альбом.] Л., 1989; Русский авангард 20-х—30-х гг. СПб., 1997. *А.І.Лісаў.*

ЕРМАЛА́ЕЎ Аляксей Мікалаевіч (23.12.1910, С.-Пецярбург — 12.12.1975),

рускі артыст балета, балетмайстар, педагог. Нар. арт. Беларусі (1940). Нар. арт. СССР (1970). Скончыў Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча (1926). Да 1930 вядучы танцоўшчык Ленінградскага т-ра оперы і балета. У 1930—58 саліст, у 1960—75 педагог-рэпетытар Вял. т-ра; у 1968—72 адначасова маст. кіраўнік Маск. харэаграфічнага вучылішча. Адзін з найб. яркіх прадстаўнікоў рус. балетнай школы 1920—40-х г., заснавальнік новага выканальніцкага стылю — гераічнага, віртуознага, насычанага драматызмам танца; значна ўзбагаціў танц. лексіку, зрабіў вял. ўплыў на наступныя пакаленні выканаўцаў. Сярод партый: Бог ветру («Талісман» Р.Дрыга), Блакітная птушка, Зігфрыд

(«Спячая прыгажуня», «Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Геній вод («Канёк-Гарбунок» Ц.Пуні), Базіль («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Альберт і Ганс («Жызэль» А.Адана), Тыбальд («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Лі Шанфу («Чырвоны мак» Р.Гліэра). Паставіў у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі першы нац. балет «Салавей» М.Крошнера (з Ф.*Лапуховым*, 1939; 2-я рэд. балета 1940 вырашана ім сродкамі дзейснага танца, арганічным спалучэннем класічнай і бел. нар. харэаграфіі), «Аповесць пра каханне» (1953) і «Палымяныя сэрцы» (1955) В.Залатарова. Сярод яго вучняў: У.*Васільеў*, А.*Гадуноў*, М.*Ліепа*. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1947, 1950.

Літ.: Аляксей Ермолаев: Сб. ст. М., 1974; Гаевский В. Дивертисмент. М., 1981; Алексей Ермолаев: Статьи. Воспоминания. М., 1982.

ЕРМАЛА́ЕЎ Юрый Міхайлавіч (н. 7.6.1932, Масква), артыст цырка. Нар. арт. СССР (1989). У цырку з 1944. З 1949 дрэсіроўшчык коней і наезнік. У 1960—75 выступаў з Л.Котавай. Выконвалі конна-балетную сюіту «Штраусіяна», сюжэтную кампазіцыю «Руская бярозка». З 1985 кіраўнік цыркавога коннага атракцыёна аб'яднання «Саюздзяржцырк» (з 1992 «Расдзяржцырк»).

ЕРМАЛІ́НСКІ Аляксандр Фёдаравіч (н. 23.1.1929, в. Калінаўка Любанскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1974). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1955). У 1965—75 працаваў у ім. Навук. працы па клініка-эксперым. даследаваннях імуналогіі і спецыфічнай дыягностыцы рэўматызму, пытаннях этыялогіі, патагенезу і прафілактыкі гэтай хваробы.

ЕРМАЛО́ВІЧ Лідзія Лукінічна (н. 18.8.1936, в. Сужэнка Данецкай вобл., Украіна), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1983), праф. (1984). Скончыла Ленінградскі ун-т (1962). У 1968—73 выкладала ў Бел. дзярж. тэхнал. ін-це. З 1973 у Бел. дзярж. эканам. ун-це. Даследуе праблемы ўліку і аналізу эфектыўнасці прамысл. вытв-сці.

Тв.: Совершенствование экономического анализа эффективности производства. Мн., 1978; Анализ эффективности хозяйственной деятельности промышленных предприятий. Мн., 1979; Анализ финансово-хозяйственной деятельности предприятия. Мн., 1997.

ЕРМАЛО́ВІЧ Мікалай Іванавіч (н. 29.4.1921, в. Малыя Навасёлкі Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), бел. гісторык і літаратуразнавец. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1947). У 1940—47 на пед. працы ва ўстановах нар. адукацыі, у 1948—57 у Маладзечанскім настаўніцкім ін-це і Маладзечанскім абл. ін-це ўдасканалення настаўнікаў. Пасля выхаду на пенсію па зроку (1957) пачаў займацца н.-д. дзейнасцю. Гал. тэмы — гісторыя Беларусі 9—14 ст. і бел. л-ра. Даследуе пытанні засялення слав. плямёнамі Усх. Еўропы, этнагенез беларусаў, паліт. гісторыю стараж. зямель Беларусі (Полацкая, Тураўская, Навагрудская і інш.), праблемы ўзнікнення ВКЛ і інш. Дзярж. прэмія Рэспублікі Беларусь 1992.

А.М.**Ермалаеў**.

Н.К.**Ерне**.

М.І.**Ермаловіч**.

Тв.: Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды. Мн., 1990; Па слядах аднаго міфа. 2 выд. Мн., 1991; Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд. Мн., 1994.

Г.В.Штыхаў.

ЕРМАЛО́ВІЧ Якуб (Якаў Сідаравіч; 7.8.1910, в. Вяшэўка Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. — 18.4.1987), бел. пісьменнік. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1959). Настаўнічаў. Дэбютаваў вершамі ў 1929. Аўтар зб-каў апавяданняў і аповесцей «Над Бярозай» (1960), «Душа чалавека» (1962), «Родная зямля» (1967), «Твар у твар» (1970), «След на зямлі» (1977). Асн. тэмы твораў — вайна, праца калгаснікаў і сельскай інтэлігенцыі.

Тв.: Сіняя птушка. Мн., 1980; Акопы не пазарасталі. Мн., 1985.

ЕРМАЧЭ́НКА Іван Абрамавіч (13.5.1894, в. Капачоўка Барысаўскага р-на Мінскай вобл. — 25.2.1970), бел. паліт. дзеяч. Скончыў Карлаў ун-т у Празе (1929). Удзельнік 1-й сусв. вайны. У грамадз. вайну афіцэр белай арміі. У 1920 эвакуіраваўся ў Турцыю, дзе далучыўся да бел. нац. руху. У 1921 дыпламат, прадстаўнік урада БНР у Канстанцінопалі і ген. консул на Балканах, у 1922 нам. міністра замежных спраў БНР у Коўне. Заснаваў консульскія аддзелы БНР у Югаславіі і Балгарыі. У 2-ю сусв. вайну з кастр. 1941 у Мінску ўзначальваў *Беларускую народную самапомач* (БНС), быў дарадчыкам ген. камісара Беларусі В.Кубэ. Вясной 1943 абвінавачаны ў парушэнні статутных задач БНС, змешчаны з усіх пасад, 27.4.1943 пераехаў у Прагу. У 1943 у Празе арыштаваны гестапа па справе забойства Кубэ. З 1948 у эміграцыі ў ЗША. Адзін з заснавальнікаў Злучанага бел.-амер. дапамогавага к-та ў Саўт-Рыверы (штат Нью-Джэрсі). Выступаў з артыкуламі ў акупац. і эмігранцкіх выданнях.

ЕРМАШКЕ́ВІЧ Барыс Кірыкавіч (1.5.1907, в. Рыскоў Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — 22.2.1982), генерал-лейтэнант (1966). Скончыў Полацкі лясны тэхнікум (1929), Вышэйшую

І.Ермянёў. Сляпыя спяваюць. 1770-я г.

спецшколу Генштаба (1941), Ваен. акадэмію Генштаба (1948). У Чырв. Арміі з 1935. У Вял. Айч. вайну на Зах., 2-м Бел. франтах: нач. аддзялення, аддзела, нам. нач. штаба арміі, нам. нач. аддзела штаба фронту. З 1945 на адказных пасадах у штабах Паўн. групы войск, ваен. акруг. З 1955 у цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР.

ЕРМАШКЕ́ВІЧ Васіль Мікітавіч (н. 13.1.1939, в. Васькавічы Чавускага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне ядзернай і нетрадыцыйнай энергетыкі. Д-р тэхн. н. (1991). Скончыў Харкаўскі авіяц. ін-т (1962). З 1976 у Ін-це ядзернай энергетыкі АН Беларусі, з 1992 дырэктар навук.-тэхн. цэнтра «Нетрадыцыйная энергетыка і энергазберажэнне» Нац. АН Беларусі. Навук. працы па працэсах гарэння паліва ў вадкасных ракетных рухавіках, стварэнні ядзерных энергет. установак. Распрацаваў рухавікі арыентацыі і стабілізацыі касм. аб'ектаў, акісляльнік для ракетнага паліва, асновы і канцэпцыю выкарыстання нетрадыцыйных крыніц энергіі ў Беларусі.

Тв.: Герметичные электронасосы для химически активных жидкостей: Конструкция, испытания, эксплуатация. Мн., 1989; Энергетика завтрашнего дня. Место в ней энергетики Беларуси // Финансы, учет, аудит. 1997. № 1.

ЕРМЯНЁЎ Іван Аляксеевіч (1746 — пасля 1797), рускі графік і жывапісец. Вучыўся ў Пецярб. АМ (1761—67) і Каралеўскай акадэміі ў Парыжы (каля 1775—88). З пач. 1790-х г. жыў у С.-Пецярбургу. Аўтар шэрагу нетыповых для рус. мастацтва 2-й пал. 18 ст. жанравых сцэн з сял. жыцця (найчасцей сляпых жабракоў), імкнуўся да дакладнай перадачы ўбачаных эпізодаў ці падзей: акварэлі «Жабракі», «Сялянскі абед», «Сляпыя спяваюць» (усе 1770-я г.).

ЁРНЕ (Jerne) Нільс Кай (23.12.1911, Лондан — 1994), дацкі імунолог. Замежны ганаровы чл. Амер. акадэміі навук і мастацтваў, чл. Дацкай каралеўскай АН. Вучыўся ў Лейдэнскім, скончыў Капенгагенскі (1951) ун-т. Да 1954 працаваў у Дацкім дзярж. ін-це сываратак, у 1960—62 у Жэнеўскім ун-це, з 1966 ва Ун-це Гётэ ў Франкфурце, у 1969—80 дырэктар Базельскага ін-та імуналогіі. З 1962 чл. Кансультатыўнай экспертнай камісіі па імуналогіі Сусв. арг-цыі па ахове здароўя. Стварыў (разам з Ф.М.Бёрнетам) кланальна-селекцыйную тэорыю імунітэту; выявіў магчымыя наступствы розных меркаванняў і распрацаваў дакладную, адзіную тэрміналогію, зручную для зносін паміж імунолагамі. Нобелеўская прэмія 1984 (разам з Г.*Кёлерам* і С.*Мільштэйнам*).

ЕРЭВА́Н, сталіца Арменіі. Размешчаны на левабярэжнай ч. Араратскай раўніны і часткова на вулканічным плато перадгор'я на р. Раздан, якая падзяляе горад на 2 ч. каньёнападобнай цяснінай. 1283 тыс. ж. (1991). Чыг. вузел. Аэрапорт. Метрапалітэн. Буйны прамысл., навук. і культ. цэнтр. Прам-сць: машынабуд. і металаапр. (з-ды: эл.-лямпавы, кабельны, гадзіннікавы, станкабуд., аўтамаб., эл.-апаратны, кампрэсарны, прыладабуд. і інш.), хім. і нафтахім. (камбінат сінт. каўчуку, ВА «Палівінілацэтат», шынны, лакафарбавы, хім. рэактываў з-ды, фармацэўтычная ф-ка), харчасмакавая (вінна-каньячныя з-ды і інш.), лёгкая (тэкст.-трыкат., абутковая ф-кі і інш.), будматэрыялаў (з-ды «Арммармур», керамічных вырабаў і інш.).

Панарама Ерэвана.

Адзін з найб. стараж. гарадоў свету. Паводле выяўленага пры раскопках урарцкага надпісу, у 782 да н.э. на месцы Е. цар *Аргішці* I пабудаваў крэпасць Эрэбуні. З сярэдзіны 13 ст. важны пункт на шляху з Араратскай далiны ў Паўн. Закаўказзі. З 1440 адм. і гандл.-рамесніцкі цэнтр Усх. Арменіі, у 16 — пач. 18 ст. горад неаднойчы быў захоплены і разбураны персамі і туркамі. У 1604 яго захапілі і зруйнавалі войскі іранскага шаха *Абаса* I, арм. насельніцтва выгнана ў Іран. Пазней горад адбудаваны і ў 17 ст. стаў буйным цэнтрам караваннага гандлю і рамесніцтва. З 1735 цэнтр *Эрыванскага ханства.* У выніку рус.-перс. вайны 1826—28 далучаны да Расіі. З 1828 цэнтр Армянскай вобл., з 1840 пав. горад, з 1849 цэнтр Эрыванскай губ. У 1901 чыгунка злучыла Е. з Тыфлісам (сучасны Тбілісі), у 1908 — з Джульфай, што садзейнічала эканам. развіццю горада. У маі 1918 тут абвешчана незалежнасць Арменіі. У 1918—20 Е. — цэнтр Эрыванскага пав., падуладнага *дашнакам.* З 1922 сталіца Арменіі.

Ад крэпасці Эрэбуні ад урарцкага перыяду (8—6 ст. да н.э.) захаваліся руіны цытадэлі з палацам, перыстыльным дваром, храмамі, ад

Да арт. **Ерэван.** Палац крэпасці Эрэбуні (рэканструкцыя). 5—4 ст. да н.э.

Да арт. **Ерэван.** Тэатр оперы і балета імя А.А.Спендыярава. Арх. А.Таманян. 1926—53.

ахеменідскага (5—4 ст. да н.э.) — рэшткі храмаў і шматкалоннай залы з размалёўкай. Сярэдневяковыя помнікі Е.: Аванскі сабор (591—602), цэрквы Катагіке (13 ст.) і Заравар (1691—1705) і інш. У 20 ст. аблічча Е. змянілася ў выніку маштабнага горадабудаўніцтва. Своеасаблівы каларыт гораду надае мясц. камень розных адценняў (ружовы, крэмавы, белы туф), які шырока выкарыстоўваецца ў буд-ве. Гал. ансамбль цэнтра Е. ўтвараюць пл. Рэспублікі і прамавугольная сетка вуліц. На плошчы знаходзяцца Дом урада Арменіі (1926—41, арх. А.І. і Г.А.Таманян), другі Дом урада (1955, арх. С.А.Сафаран, В.А.Арэўшацян, Р.С.Ісраэлян), Гіст. музей Арменіі (1957), гасцініца «Арменія» (1958), будынак Мін-ва сувязі і Савета прафсаюзаў (1956—58; арх. ўсіх М.У.Грыгаран і Э.А.Сарапян). Сярод грамадскіх пабудоў: Дзярж. т-р оперы і балета імя А.А.Спендыярава (1926—39, арх. А.І.Таманян, завершаны ў 1953), сховішча стараж. рукапісаў Матэнадаран (1959, арх. Грыгаран), драм. т-р імя Г.Сундукяна (1965, арх. Р.Б.Алавердзян і Р.А.Бадалян), Музей гісторыі Ерэвана (1968, арх. Ш.Р.Азацян, Б.А.Арзуманян, скульпт. А.А.Аруцюнян), стадыён «Раздан» (1967—72, арх. К.А.Акапян), гасцініца «Двін» (1979, арх. Ф.С.Акапян, А.С.Алексанян, Э.А.Сафаран). Помнікі: С.Шаўмяну (1931, скульпт. С.Дз.Мяркураў, арх. І.У.Жалтоўскі), Давіду Сасунскаму (1959, Е.С.Качар), ахвярам генацыду армян 1915 (1967, арх. А.А.Тарханян, С.Г.Калашан) і інш.

АН Арменіі. Сховішча стараж. рукапісаў *Матэнадаран*. 11 ВНУ (у т.л. ун-т, кансерваторыя, політэхн., мед., маст.-тэатр., пед. ін-ты). Тэатры (у т.л. оперы і балета). Музеі: Дзярж. карцінная галерэя, нар. мастацтва Арменіі, сучаснага мастацтва Арменіі, рус. мастацтва і інш.

ЕРЭВА́НСКАЕ ХА́НСТВА, гл. *Эрыванскае ханства*.

ЕСАКО́Ў Алесь (Аляксандр Аляксандравіч; 18.12.1911, в. Новікава Галіцкага р-на Кастрамской вобл., Расія — 13.6.1985), бел. крытык і тэатразнавец. Вучыўся ў Ін-це тэатр. мастацтва імя Луначарскага (1932—35, Масква). Працаваў у ТРАМе, газ. «Літаратура і мастацтва» і інш. У 1960—74 у Літ. музеі Я.Купалы. Аўтар кніг «Уладзімір Крыловіч» (1956), «Янка Купала і беларускі тэатр» (1972), «Зерне да зерня: Абразкі з жыцця Янкі Купалы» (1977).

ЕСЕНБЕ́РЛІН Ільяс (1.1.1915, г. Атбасар, Казахстан — 4.10.1983), казахскі пісьменнік. Скончыў Каз. горна-металургічны ін-т (1940). Друкаваўся з 1945. У паэмах «Айша», «Султан» (абедзве 1945), «Трагедыя Біржан-Сала» (1959), раманах «Схватка» (1966; Дзярж. прэмія Казахстана імя Абая 1968), «Небяспечная пераправа» (1967), «Закаханыя» (1968), «Залатыя коні прачынаюцца» (1976), гіст. трылогіях «Качэўнікі» (1969—73; асобнае выд. 1976), «Залатая Арда» (кн. 1—3, 1979—83) сучаснае і мінулае каз. народа, лёс і праблемы вёскі. Аўтар п'ес, тэкстаў каз. песень (больш за 40). На бел. мову асобныя творы Е. пераклаў В.Бечык.

Тв.: Бел. пер. — Небяспечная пераправа: Раман. Мн., 1985. *Ж.Сахіеў.*

ЕСЕНІК (Jesenik), кліматычны курорт у Чэхіі. На схілах аднайм. гор паблізу мяжы з Польшчай. Развіваецца з 19 ст., калі мясц. лекарам-практыкам была пабудавана першая ў Еўропе водалячэбніца. Умераны клімат, ахаванасць ад вятроў, хваёвыя лясы ствараюць умовы для лячэння хвароб ц.н.с. (пераважна неўрозаў) і органаў дыхання. Папулярнае месца адпачынку, турызму і зімовага спорту. У наваколлі арх.-гіст. помнікі (стараж. замкі), помнікі прыроды (пячоры, горныя і лясныя комплексы і інш.).

ЕСЕНСКІ (Jesenský) Янка (30.12.1874, г. Марцін, Славакія — 27.12.1945), славацкі пісьменнік. Д-р права (1901). Нар. мастак Чэхаславакіі (1945). Друкаваўся з 1897, прызнанне атрымаў як паэт-лірык (зб. «Вершы», 1905, і «Вершы II», выд. ў 1923) і як навеліст з яркім сатырычным талентам (кн. «Правінцыяльныя апавяданні», 1913). У 1-ю сусв. вайну на ўсх. фронце, добраахвотна здаўся ў палон. Знаходзіўся ў лагерах, потым на вольным пасяленні ў Варонежы, Кіеве і Пецярбургу, дзе працаваў у рэдакцыі славацкай газеты. Настроі гэтай пары адлюстраваны ў зб. вершаў «З палону» (1919) і ў кн. ўспамінаў «Шляхам да волі» (1933). У паэт. зб-ках «Пасля буры» (1934), «Супраць ночы» і «На злобу дня I, II» (абодва 1945), «Чорныя дні» (1948) рэзкая крытыка тагачасных падзей, асабліва фашызму. Аўтар кн. апавяданняў «Навелы» (1921), «З старых часоў» (1935), сатыр. рамана «Дэмакраты» (ч. 1—2, 1934—37).

Тв.: Рус. пер. — Избр. лирика. М., 1981.
І.А.Чарота.

ЕСЕНТУКІ, горад у Расіі, у Стаўрапольскім краі, у даліне р. Падкумак. Засн. ў 1798 як ваенна-памежны рэдут. 87,1 тыс. ж. (1992). Чыг. ст. Прадпрыемствы харчасмакавай і лёгкай прам-сці. Драўляная Нікольская царква (сярэдзіна 1820-х г.). Курортны (Галоўны) парк (1849) з крыніцамі мінер. вод і шматлікімі пабудовамі 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Бальнеалагічны і грязевы курорт. Уваходзіць у групу курортаў *Каўказскія Мінеральныя Воды*. Аснову курортных рэсурсаў складаюць мінер. воды, якія ў лек. мэтах выкарыстоўваюцца з сярэдзіны 19 ст. (эксплуатуецца каля 20 крыніц), найб. вядомыя «Есентукі» № 4 і № 17. Асн. профіль курорта — лячэнне хвароб органаў стрававання, у т.л. печані, падстраўнікавай залозы, жоўцевых шляхоў. Каля 30 санаторыяў і пансіянатаў (большасць з іх паблізу Гал. курортнага парку), працуе НДІ курарталогіі і фізіятэрапіі.

ЕСІПАВА Ганна Мікалаеўна (12.2.1851, С.-Пецярбург — 18.8.1914), руская піяністка і педагог; адна з буйнейшых прадстаўніц піяністычнага мастацтва канца 19 — пач. 20 ст. Вучылася ў Пецярбургскай кансерваторыі (1865—70, клас Т.Лешаціцкага), з 1893 выкладала ў ёй (праф. з 1901). Дэбютавала ў 1868, канцэртавала ў Расіі і за мяжой да 1908. Выступала і як ансамбліст (у дуэце з Л.*Аўэрам*, у трыо з ім і А.Вержбіловічам). Яе мастацтву ўласцівы рацыяналістычнасць інтэрпрэтацыі, віртуознасць, пявучасць гуку. Стварыла адну з буйнейшых рус. піяністычных школ (сярод вучняў С.*Пракоф'еў*).

ЕСПЕРСЕН (Jespersen) Енс Ота Хары (16.7.1860, г. Рандэрс, Данія — 30.4.1943), дацкі моваznавец. Праф. англ. мовы ў Капенгагенскім ун-це (з 1893). Аўтар падручніка англ. мовы (1895; 19 выданняў), у аснову якога пакладзена жывая размоўная мова. Сваё разуменне граматыкі як жывога цэлага, што ўвесь час развіваецца, адлюстраваў у працы «Філасофія граматыкі» (1924). Аўтар «тэорыі прагрэсу» ў мове, паводле якой усе моўныя змены накіраваны на аблягчэнне ўмоў камунікацыі, а таму — прагрэсіўныя. Стварыў праект міжнар. штучнай мовы — навіяль. Працы Е. паўплывалі на развіццё моваznаўства 20 ст.

Тв.: Рус. пер. — Философия грамматики. М., 1958.

ЕСЬМАН Іосіф Гаўрылавіч (13.12.1868, г. Вілейка Мінскай вобл. — 1.7.1955), савецкі вучоны ў галіне гідраўлікі і гідраэнергетыкі. Акад. Азерб. АН (1945). Д-р тэхн. н., праф. (1933). Герой Працы (1932). Засл. дз. нав. Азерб. ССР (1929). Скончыў Пецярбургскі тэхнал. ін-т (1892). Працаваў на чыгунцы, стажыраваўся ў Аўстрыі, Германіі, Швейцарыі. У 1902—15 у Пецярбургскім політэхн. ін-це. З 1917 у Закаўказзі. Арганізатар і першы рэктар Уладзікаўказскага політэхн. ін-та, з 1922 у Азерб. політэхн. ін-це (да 1929 рэктар), адначасова з 1932 дырэктар энергет. Ін-та Азерб. АН, якому ў 1943 прысвоена імя Е. Навук. працы па нафтавай гідраўліцы, газадынаміцы і гідрамашынабудаванні. Прымаў удзел у праектаванні нафтаправода Баку—Батумі і інш. аб'ектаў нафтавай прам-сці, кансультант буд-ва буйнейшых ГЭС Закаўказзя. Аўтар падручніка «Гідраўліка» (10 выд.).

Літ.: И.Г.Есьман, 1868—1955; Библиогр. Баку, 1969.

ЕСЬМАН Руслан Іосіфавіч (н. 16.4.1941, Мінск), бел. вучоны ў галіне цеплафізікі ліцейных працэсаў. Д-р тэхн. н., праф. (1993). Скончыў Ленінградскі ваенна-мех. ін-т (1963). З 1965 у Бел. політэхн. акадэміі. Навук. працы па цеплафіз. асновах, тэорыі і тэхналогіі ліцейных працэсаў. Распрацаваў адзіную сістэму матэм. апісання працэсаў фарміравання адліўкі складанай канфігурацыі ў метал. форме.

Тв.: Расчеты процессов литья. Мн., 1977 (разам з М.П.Жмакіным, Л.І.Шубай); Термодинамика, теплопередача и двигатели внутреннего сгорания. Мн., 1985 (разам з Б.Я.Жалезкам, У.М.Адамавым).

ЕЎГЕ́НІКА (ад грэч. eugenēs добрага роду), вучэнне аб спадчынным здароўі чалавека, шляхах яго захавання і паляпшэння. Прыхільнікі Е. сфармуляваў англ. вучоны Ф.Гальтан (1869), які прапанаваў вывучаць тыя фактары, што могуць палепшыць спадчынныя якасці

(генет. перадумовы фіз. і псіхічнага здароўя, разумовых здольнасцей, адоранасць) будучых пакаленняў. Ідэі Е. нярэдка выкарыстоўвалі для апраўдання *расізму* і *генацыду*. У сучаснай навуцы многія праблемы Е., асабліва барацьба са спадчыннымі захворваннямі, вырашаюцца ў рамках *генетыкі* чалавека, яго экалогіі, у т.л. мед. генетыкі. Ад ідэі паляпшэння генет. здароўя людзей Е. перайшла пераважна да задач яго захоўвання. Гл. *Медыка-генетычнае кансультаванне*.

ЕЎДАКІМАЎ Уладзімір Мікітавіч (н. 6.5.1939, г. Об Новасібірскай вобл., Расія), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1988). Скончыў Новасібірскі інж.-буд. ін-т (1971). З 1961 працаваў у Ін-це «Сібакадэмпраект». З 1971 у ін-це «Гроднаграмадзянпраект». Асн. работы ў Гродне: Дом піянераў і школьнікаў (1976), будынкі аблвыканкома (1982), упраўлення «Гроднасельбуд» (1981), кардыялагічнага цэнтра (1984), гасцініцы «Гродна» (1985), кінатэатра «Кастрычнік» (1987), аэравакзала (1991, усе ў сааўт.) і інш.

ЕЎДАКІМАЎ Яраслаў Аляксандравіч (н. 22.11.1946, в. Карысць Карэцкага

Я.Еўдакімаў.

р-на Ровенскай вобл., Украіна), бел. спявак (лірычны барытон). Засл. арт. Беларусі (1980), нар. арт. Беларусі (1987). Скончыў Мінскае муз. вучылішча імя М.Глінкі (1981). Творчую дзейнасць пачаў у 1975 як саліст Бел. філармоніі, з 1977 саліст Ансамбля песні і танца БВА, у 1980—90 — Бел. тэлебачання і радыё. Валодае моцным гнуткім голасам прыгожага мяккага тэмбру, тонкай музыкальнасцю. Мае вял. канцэртны рэпертуар, значнае месца ў якім займаюць песні бел. кампазітараў Я.Глебава, В.Іванова, І.Лучанка, Дз.Смольскага і інш., бел., рус. і ўкр. нар. песні, а таксама творы духоўнай музыкі. Дыпламант усесаюзнага конкурсу «З песняй па жыцці» (1979).

Г.М.Загародні.

ЕЎІНСКАЯ ДРУКА́РНЯ. Існавала з 1610 да сярэдзіны 17 ст. ў мяст. Еўе каля Вільні (цяпер г. Вэвіс, Літва). Засн. праваслаўным віленскім Святадухаўскім брацтвам ва ўладанні шляхціца Б.Агінскага. Кіравалі друкарняй Л.*Карповіч* (да 1620), потым Гаўрыла Іванавіч. Выпусціла больш за 25 выданняў: некалькі кніг на польскай мове (у асноўным панегірыкі), большасць на царк.-слав. мове, у т.л. «Новы запавет з Псалтыром» (1611), «Дыёптра» (1612, у перакладзе Віталія), «Казанне двое...» Карповіча (1615), «Буквар славянскай мовы» і «Кінавіен» (1618), «Граматыка славянская» М.Сматрыцкага (1619), «Ірмалой» (1642) і інш., 4 выданні на бел. мове, у т.л. «Евангелле вучыцельнае» Каліста (1616). Асобныя выданні на бел. мове мелі прадмовы і пасляслоўі, каментарыі на палях. Кнігі, надрукаваныя кірыліцай, вызначаліся высокімі маст.-паліграф. якасцямі, своеасаблівым арнаментам і гравюрамі, шырока выкарыстоўваліся бел. і ўкр. брацтвамі ў навуч.-асв. і царк.-рэліг. дзейнасці. У аздобе кніг выкарыстоўвалі дошкі віленскай друкарні Ф.Скарыны (ініцыялы і застаўкі). Выданні распаўсюджваліся на Беларусі, Украіне, часткова ў Расіі. *Г.Я.Галенчанка.*

ЕЎЛАШО́ЎСКІ Фёдар Міхайлавіч (7.2.1546, г. Ляхавічы Брэсцкай вобл. — 1-я пал. 1619), бел. грамадскі дзеяч і пісьменнік-мемуарыст. Самаадукацыяй набыў веды ў галіне матэматыкі, справаводства, юрыспрудэнцыі. Ад навагрудскай шляхты быў паслом на Люблінскім (1569) і Варшаўскім (1579) сеймах. Разам з А.Трызнам удзельнічаў у выпрацоўцы дзярж.-прававога дакумента — «Трыбунала Вялікага княства Літоўскага», у 1592—1613 падсудак (адвакат) у Навагрудскім земскім судзе. Прытрымліваўся памяркоўна-ліберальных поглядаў. З літ. спадчыны пакінуў *дыярыуш* — самы ранні помнік мемуарнага жанру ў бел. л-ры канца 16 — пач. 17 ст. Мемуары пераважна аўтабіягр. характару, дзе адлюстраваны культ., сац. і паліт. жыццё суайчыннікаў (найперш прадстаўнікоў шляхты), іх погляды і грамадскія ўзаемаадносіны.

Тв.: У кн.: Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983.

Літ.: Свяжынскі У.М. «Гістарычныя запіскі» Ф.Еўлашоўскага. Мн., 1990.

ЕЎНУХАІДЫ́ЗМ (ад грэч. eunuchos кастрат + eidos від), спалучэнне недаразвіцця палавых органаў і *другасных палавых прыкмет* з дыспрапарцыянальным целаскладам. Абумоўлены гіпафункцыяй палавых залоз. Найчасцей бывае ў мужчын. Адрозніваюць 2 формы Е.: еўнухаідны гігантызм і еўнухаіднае атлусценне; звычайна назіраецца змешаны тып. Прыкметы Е.: парушэнне росту — гігантызм і дыспрапорцыі шкілета (доўгія канечнасці, асабліва ніжнія, пры кароткім тулаве), тонкія косці, вузкія плечы, шырокія памеры таза (у жанчын — вузкі таз), атлусценне, адсутнасць расліннасці на твары, лабку, у падпахавых упадзінах, высокі тэмбр голасу; палавыя пачуцці рэзка зніжаны. Лячэнне: гармонатэрапія.

ЕЎПАТО́РЫЯ, горад на Украіне, у Рэспубліцы Крым, на беразе мелкаводнага заліва Чорнага м. 110,5 тыс. ж. (1991). Порт, чыг. станцыя. З-ды: рамонтна-мех., вінаробны, малочны, рыбны. Краязнаўчы музей, тэатр. Арх. помнікі: мячэць Джума-Джамі (1552), тур. лазня (16 ст.), 2 караімскія храмы (18 ст.).

У 6—5 ст. да н.э. на месцы сучаснай Е. грэкі заснавалі калонію Керкінітыда (згадваецца ў Герадота). У 3 ст. да н.э. належала *Херсанесу Таўрычаскаму*. У 2 ст. да н.э. на месцы б. калоніі размяшчаўся рым. ваен. лагер, названы Е. ў гонар *Мітрыдата VI Еўпатара*. У 4 ст. н.э. горад заняпаў. У 15 ст. рэзідэнцыя крымскіх ханаў, у 16—17 ст. на месцы Е. тур. крэпасць і горад Гезлёў, адзін з пунктаў гандлю рабамі ў Крыме. З 1783 у складзе Расіі, у 1784 перайменавана ў Е. У час рус.-тур. вайны 1853—54 захоплена па чарзе франц., англ. і тур. войскамі. Месца ваен. дзеянняў у час грамадз. вайны (1918—22). У 2-ю сусв. вайну акупіравана ням.-фаш. войскамі (1941—44).

Прыморскі кліматычны і бальнеагразевы курорт. Развіваецца з канца 19 ст., у сав. час ператварыўся ў дзіцячы курорт. Субтрапічны клімат, пляжы, працяглы купальны сезон і інш. фактары спрыяюць эфектыўнаму аздараўленню і лячэнню дзяцей, хворых на рэўматызм, з парушэннямі функцый органаў дыхання (нетуберкулёзнага паходжання), руху і апоры (у т.л. касцёва-сустаўнага туберкулёзу, скаліёзу), нырак, нерв. сістэмы (інфекц. этыялогіі) і інш. У лячэнні выкарыстоўваюць аэра-, гелія- і таласатэрапію, азёрныя і ліманныя гразі, рапу, мінер. і тэрмальныя воды. Дзесяткі санаторыяў, пансіянатаў і баз адпачынку, у т.л. для дарослых.

ЕЎРАБА́ЧАННЕ, міжнародная арганізацыя тэлебачання, заснаваная ў 1954 у рамках *Еўрапейскага саюза радыёвяшчання* для рэгулярнага абмену перадачамі паміж краінамі-ўдзельніцамі і сумеснай падрыхтоўцы праграм. Аб'ядноўвае 95 тэлекампаній з 80 краін (1997). З 1996 у Е. ўваходзіць Беларусь.

ЕЎРАДО́ЛАРЫ (англ. Eurodollar), грашовыя сродкі ў доларах ЗША, размешчаныя іх уладальнікамі за межамі ЗША, пераважна ў еўрап. банках. Банкаўскія рахункі ў доларах даюць магчымасць банкам, у якіх гэтыя рахункі адкрыты, выкарыстоўваць доларавыя грошы для аперацый на міжнар. рынку пазыкавых капіталаў, таму што *долар* прызнаны ў якасці сусв. валюты.

ЕЎРАЗІ́ЙСТВА, ідэйна-палітычная і філас. плынь у рас. эміграцыі 1920—30-х г. Пачаткам руху стаў выхад зб. «Выйсце да Усходу» (Сафія, 1921) групы маладых рус. вучоных-эмігрантаў. Гіст.-філас. і геапаліт. дактрына Е., услед за ідэямі позніх *славянафілаў*, ва ўсім супрацьпастаўляла гіст. лёсы, задачы і інтарэсы Расіі і Захаду і трактавала Расію як «Еўразію». Асн. тэарэтыкі — М.С.*Трубяцкой*, Г.В.Фларoўскі, Л.П. *Карсавін*, П.М.Савіцкі, Г.У.*Вярнадскі*. Мэта Е. — стварыць новую ідэалогію,

здольную асэнсаваць тое, што адбылося з Расіяй пасля Кастр. рэвалюцыі 1917, і абгрунтаваць метады дзеяння «для адраджэння Айчыны» на аснове трывалага Саюза ўсходнеславянскіх народаў — рускіх, украінцаў, беларусаў. Тэрыторыю Расіі (СССР) еўразійцы разумелі як непаўторную гіст. і геагр. індывідуальнасць, адметны свет, які не належыць ні да Еўропы, ні да Азіі. Агульнаметадалагічным іх прынцыпам стаў поліцэнтрызм: Еўразія не супрацьпастаўляецца ўсяму «астатняму свету», яна — не якісьці міфічны цэнтр, што дамінуе ў свеце, а адзін з сусв. цэнтраў. Асн. ідэі Е.: самабытнасць культуры (на базе велікарускай), панаванне ідэалогіі (стрыжань — праваслаўе), агульнанац. інтарэс; канцэпцыя ўлады прадугледжвала кіруючую партыю (пераемніцу бальшавікоў) як дзярж.-ідэалаг. саюз, які не супадае з дзярж. апаратам. На 1-м этапе еўразійцы ажыццявілі шэраг плённых гіст.-культ. распрацовак, але потым Е. пачало набываць усё больш паліт. афарбоўку: левае яго крыло прызнавала заканамернасць рас. рэвалюцыі і апраўдвала бальшавізм, што выклікала пратэст другой часткі еўразійцаў. У выніку некалькіх расколаў у сярэдзіне 1930-х г. Е. як арганізаваны рух спыніла сваё існаванне. У апошнія гады інтарэс да яго ідэй аднавіўся.

Літ.: Л ю к с Л. Евразийство: Пер. с нем. // Вопр. философии. 1993. № 6.

В.А.Ярмоленка.

ЕЎРА́ЗІЯ, самы вялікі мацярык Зямлі. Размешчаны ў Паўн. паўшар'і (ч. астравоў у Паўд. паўшар'і). У Е. ўваходзяць дзве часткі свету — *Еўропа* і *Азія*. Тэрмін увёў у 19 ст. аўстр. геолаг Э.Зюс, абгрунтоўваючы яго адсутнасцю выразнай структурнай мяжы паміж Еўропай і Азіяй. Абмываецца на Пн Паўн. Ледавітым, на З Атлантычным, на У Ціхім, на Пд Індыйскім ак. і іх морамі. З З на У распасціраецца на 16 тыс. км, з Пн на Пд — на 8 тыс. км. Пл. 54,9 млн. км^2, з астравамі 57,7 млн. км^2, або больш за $^1/_3$ паверхні сушы. Нас. 4,1 млрд. чал. (1993). Е. аб'ядноўваюць неперарыўнасць сушы, сучасная тэктанічная кансалідаванасць мацерыка, адзінства многіх кліматычных працэсаў. Тут прадстаўлены ўсе геагр. паясы Паўн. паўшар'я, ад арктычнага да экватарыяльнага. Умоўная мяжа паміж Еўропай і Азіяй пралягае па ўсх. падножжы Уральскіх гор, р. Эмба, паўн. ч. Каспійскага м., Кума-Манычкай упадзіне, паўн. мяжы Каўказскіх гор, Азоўскім і Чорным м. і пралівах паміж Чорным і Міжземным м.

ЕЎРАІНАЎСКІ ЛЕ́ТАПІС, помнік бел.-літоўскага летапісання, спіс 2-га бел.-літоўскага летапіснага зводу 3-й, поўнай рэдакцыі. Збярогся ў гіст. зборніку канца 17 ст. рус. паходжання, які ў пач. 19 ст. належаў П.Еўраінаву. Летапіс пачынаецца з легендарнай гісторыі Літвы ад Палемона да Гедзіміна, падзеі 14 — 1-й пал. 15 ст. выкладзены паводле *Беларуска-літоўскага летапісу 1446*. У заключнай арыгінальнай частцы змешчаны пагадовыя запісы, прысвечаныя паліт. гісторыі ВКЛ з сярэдзіны 15 ст. да 1548 уключна. Зместам гэта частка блізкая да Пазнанскага спіса *«Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»*. Характэрная асаблівасць Е.л. — наяўнасць у ім гіст.-літ. матэрыялаў (напр., аповесць пра паходы Альгерда на Маскву і інш.), якія ёсць толькі ў *Хроніцы Быхаўца*. Рукапіс зберагаецца ў Рас. дзярж. архіве стараж. актаў у Маскве. Апублікаваны ў «Поўным зборы рускіх летапісаў» (т. 35, 1980).

ЕЎРАКА́РД (англ. Eurocard), міжнародная крэдытная картка з правам карыстання ёй у любой краіне, якая з'яўляецца ўдзельніцай еўрап. банкаўскай сістэмы.

ЕЎРАКО́СМАС, аб'яднанне прамысловых прадпрыемстваў 11 краін Еўропы, створанае ў 1961 для развіцця касмічнай тэхнікі і касманаўтыкі. У Е. уваходзіць каля 150 авіяфірм, фірм электронікі, механікі, хіміі і інш., якія распрацоўваюць абсталяванне для спадарожнікаў радыёсувязі і тэлебачання.

ЕЎРАПАРЛА́МЕНТ, гл. *Еўрапейскі парламент*.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЕ АБ'ЯДНА́ННЕ ВУ́ГАЛЮ І СТА́ЛІ (ЕАВС), дзяржаўна-манапалістычная арганізацыя, створаная ў 1951 з мэтай садзейнічаць пашырэнню і мадэрнізацыі здабычы вугалю, руды, вытв-сці металу. Напачатку аб'ядноўвала ФРГ, Францыю, Італію, Бельгію, Нідэрланды і Люксембург, пазней з расшырэннем складу ўдзельнікаў *Еўрапейскай эканамічнай супольнасці* ўключыла Вялікабрытанію, Данію, Ірландыю, Грэцыю, Іспанію і Партугалію. У 1967 органы аб'яднання зліліся з органамі ЕЭС і Еўраатама. Штаб-кватэра ў г. Брусель (Бельгія).

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЕ КАСМІ́ЧНАЕ АГЕ́НЦТВА (European Space Agency; ЕКА), міжнародная арганізацыя, якая аб'ядноўвае 13 дзяржаў Еўропы (Францыя, Германія, Італія, Бельгія, Вялікабрытанія і інш.). Створана ў 1975 з мэтаю развіцця даследаванняў касм. прасторы і выкарыстання на камерцыйнай аснове спадарожнікавых сродкаў для сувязі, тэлебачання, дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, навігацыі, метэаралогіі і інш. Мае сетку станцый сачэння за палётамі касм. апаратаў з цэнтрам кіравання ў г. Дармштат (Германія). Краіны — члены Е. к.а. маюць свае касм. агенцтвы для вырашэння задач па даследаванні і выкарыстанні касм. прасторы ў нац. мэтах.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЕ ФІЗІ́ЧНАЕ ТАВАРЫ́СТВА (European Physical Society; ЕФТ). Засн. ў 1968. Члены (1997) — фіз. таварыствы, н.-д. ўстановы і вучоныя 36 краін (у т.л. Рэспублікі Беларусь з 1993).

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ АСАЦЫЯ́ЦЫЯ НАВЕ́ЙШАЙ ГІСТО́РЫІ, гл. *Міжнародная асацыяцыя навейшай гісторыі Еўропы*.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ ВАЛЮ́ТНАЯ АДЗІ́НКА (European Currency Unit; ЭКЮ), валютная адзінка, якая выкарыстоўваецца ў *Еўрапейскай валютнай сістэме*. Уведзена ў 1979. Суадносіны (парытэт) ЭКЮ з валютамі інш. краін вызначаюцца зыходзячы з таго, што ЭКЮ з'яўляецца прадстаўніком усяго «кошыка валют» краін, якія ўваходзяць у еўрап. валютную сістэму.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ ВАЛЮ́ТНАЯ СІСТЭ́МА (European Monetary System; ЕВС), арганізацыйна-эканамічная форма адносін шэрагу краін *Еўрапейскіх супольнасцей* (з 1.11.1993 *Еўрапейскага саюза*) у валютнай сферы; рэгіянальная валютная сістэма ў структуры сусв. валютнай сістэмы. Створана ў 1979 з мэтай абмежаваць уплыў ваганняў курсу амер. долара (яго «плаваючы курс» уведзены ў 1971) на эканоміку краін, якія ўвайшлі ў ЕВС, забяспечыць устойлівыя суадносіны курсаў еўрап. валют для правядзення адзінай палітыкі стабілізацыі валютнай сферы і згладжвання вынікаў ваганняў курсаў валют. Уключае ўстанаўленне рамак ваганняў найб. слабых і найб. моцных валют краін — удзельніц ЕВС і межаў ваганняў для кожнай пары валют, увядзенне *Еўрапейскай валютнай адзінкі* (ЭКЮ); механізм аказання крэдытнай і фін. дапамогі для падтрымкі курсу валюты ў межах узгодненага дыяпазону адхілення. У адносінах да валют краін, якія не ўваходзяць у ЕВС, ажыццяўляецца рэжым «плаваючага» валютнага курсу.

Л.І.Шмыгава.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ КАНВЕ́НЦЫЯ АБ АХО́ВЕ ПРАВО́Ў ЧАЛАВЕ́КА І АСНО́ЎНЫХ СВАБО́Д. Падпісана ў 1950 у Рыме дзяржавамі — членамі *Савета Еўропы*, увайшла ў дзеянне ў 1953, дапоўнена 10 дадатковымі пратаколамі (апошні — у 1992). Устанаўлівае кантрольны судовы механізм, які дзейнічае на падставе індывід. скаргаў фіз. асоб і скаргаў дзяржаў аб парушэннях палажэнняў канвенцыі. Для разгляду скаргаў створаны Еўрап. камісія і Еўрап. суд па правах чалавека. У гэтым удзельнічалі таксама Камітэт міністраў — гал. паліт. орган Савета Еўропы. Месцазнаходжанне ўсіх — г. Страсбур (Францыя).

Н.К.Мазоўка.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ КАНФЕДЭРА́ЦЫЯ ПРАФСАЮ́ЗАЎ (ЕКП), міжнародны рэгіянальны прафцэнтр. Створаны 8.2.1973 у Бруселі (Бельгія). Аб'ядноўвае прафсаюзы с.-д. і хрысц. кірунку зах.-еўрап. краін. У апошнім кангрэсе (1995) удзельнічала 79 прафцэнтраў (больш за 46 млн. чал.) з 22 краін. Кіруючыя органы: кангрэс, выканком, сакратарыят на чале са старшынёй, ген. сакратаром і яго намеснікам. Гал. мэты ЕКП — прадстаўніцтва і абарона сац.,

эканам. і культ. інтарэсаў працоўных на еўрап. узроўні ў цэлым і ва ўсіх еўрап. ін-тах; барацьба за захаванне і ўмацаванне дэмакратыі ў Еўропе і інш. ЕКП ажыццяўляе работу на галіновым узроўні праз еўрап. прафс. камітэты, кіруе створаным у 1978 Еўрап. прафс. ін-там — цэнтрам дакументацыі і даследаванняў па прафс. і сац.-эканам. пытаннях.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ ПАТЭ́НТНАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ (ЕПА), рэгіянальная арганізацыя, задачай якой з'яўляецца выдача еўрап. патэнтаў на аснове норм агульных для ўсіх удзельнікаў краін *Еўрапейскай эканамічнай супольнасці*. Засн. ў 1977. Асн. мэта — спрашчэнне справаводства па патэнтных заяўках у Еўропе: замест некалькіх патэнтных заявак на розных мовах можна падаць заяўку на адной мове і весці справаводства ў адным ведамстве для набыцця патэнтаў у некалькіх еўрап. дзяржавах. Месцазнаходжанне ЕПА — г. Мюнхен (Германія).

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ СУПО́ЛЬНАСЦЬ ПА А́ТАМНАЙ ЭНЕ́РГІІ, Еўратам. Створана адначасова з *Еўрапейскай эканамічнай супольнасцю* (ЕЭС) у 1957 у складзе той жа групы краін з мэтай аб'яднання рэсурсаў атамнай энергіі, атамнай прам-сці і навук.-тэхн. патэнцыялу ў галіне ядз. фізікі і энергетыкі, а таксама каардынацыі нац. праграм развіцця ядз. энергетыкі. Уключае Бельгію, Вялікабрытанію, Германію, Грэцыю, Данію, Ірландыю, Іспанію, Італію, Люксембург, Нідэрланды, Партугалію, Францыю. У 1967 органы Еўратама зліліся з органамі ЕЭС і *Еўрапейскім аб'яднаннем вугалю і сталі*. Штаб-кватэра ў г. Брусель (Бельгія).

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ ЭКАНАМІ́ЧНАЯ КАМІ́СІЯ ААН (ЕЭК), орган ААН, створаны ў 1947 у мэтах садзейнічання эканам. адраджэнню разбураных вайной краін Еўропы. Статус пастаяннага органа ААН набыла ў 1951. Членамі ЕЭК з'яўляецца большасць еўрап. дзяржаў, у т.л. Беларусь і Расія. ЕЭК садзейнічае развіццю гандлю і навук.-тэхн. супрацоўніцтва, ажыццяўляе доўгатэрміновае эканам. планаванне, накіроўвае і каардынуе работу сваіх дапаможных органаў. ЕЭК узначальваецца выканаўчым сакратаром. Кіруючым органам ЕЭК з'яўляецца чарговая сесія, якая праводзіцца штогод. Месцазнаходжанне сакратарыята ЕЭК — г. Жэнева (Швейцарыя).

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ ЭКАНАМІ́ЧНАЯ СУПО́ЛЬНАСЦЬ (ЕЭС), «Агульны рынак», група з 12 зах.-еўрап. краін (Бельгія, Вялікабрытанія, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Іспанія, Італія, Люксембург, Нідэрланды, Партугалія, Францыя), якія ў 1957 аб'ядналіся ў эканам. саюз і ажыццявілі інтэграцыю сваіх эканомік. У ЕЭС створаны адзіны ўнутр. рынак, зняты абмежаванні на свабоднае перамяшчэнне тавараў, капіталаў, рабочай сілы паміж краінамі, створана адзіная валютная сістэма, устаноўлена агульная с.-г. і трансп. палітыка. У 1967 органы *Еўрапейскага аб'яднання вугалю і сталі* і *Еўрапейскай супольнасці па атамнай энергіі* зліліся з органамі ЕЭС і трыадзіная інтэграцыйная арг-цыя пачала афіцыйна называцца Еўрапейскімі супольнасцямі, а неафіцыйна з 1992 — Еўрапейскай супольнасцю, якая мае агульныя выканаўчыя, прававыя і заканад. органы. Супольнасць мае таксама цесныя сувязі з краінамі, якія сталі на шлях развіцця. Кіруючыя органы ЕЭС — Камісія і Савет Міністраў — знаходзяцца ў г. Брусель (Бельгія).

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ АНЧО́УС, гл. *Анчоус*.

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ БАНК РЭКАНСТРУ́КЦЫІ І РАЗВІЦЦЯ (European Bank for Reconstruction and Development; ЕБРР), спецыялізаваная міжнар. эканам. арг-цыя. Створаны ў 1991. Чл. ЕБРР — 57 краін, а таксама *Еўрапейскі саюз* і *Еўрапейскі інвестыцыйны банк*. Месца знаходжання — г. Лондан. Мэта ЕБРР — фін. падтрымка краін Цэнтр. і Усх. Еўропы, якія заявілі аб сваёй прыхільнасці дэмакр. прынцыпам (шматпарт. дэмакратыя, плюралізм, рыначная эканоміка), садзейнічанне іх пераходу да адкрытай рыначнай эканомікі і прыватнага прадпрымальніцтва. Устаноўчы капітал банка 10 млрд. ЭКЮ. Гал. органы — Савет кіраўнікоў, Савет дырэктараў, Кансультатыўны савет па пытаннях навакольнага асяроддзя. Мае прадстаўніцтвы ў краінах, якім аказваецца дапамога, у т.л. на Беларусі. *С.Ф.Свілас.*

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ ВАЛЮ́ТНЫ САЮ́З, форма інтэграцыі краін-членаў *Еўрапейскага саюза* (ЕС) у валютна-фін. сферы. Рашэнне аб стварэнні саюза абвешчана *Маастрыхцкім дагаворам 1992*. План паэтапнага пераходу да Е.в.с. прадугледжваў «эканамічную канвергенцыю» і стабілізацыю валютных курсаў, абмежаванне інфляцыі і доўгатэрміновых працэнтных ставак, нац. запазычанасці і межаў дэвальвацыі нац. валют. Яго рэалізацыя прадугледжвае стварэнне ў 1998 Еўрап. цэнтр. банка, у якім будуць прадстаўлены нац. цэнтр. банкі, і ўвядзенне ў абарачэнне адзінай грашовай адзінкі з 1.1.1999 ва ўсіх краінах ЕС. *Л.І.Шмыгава.*

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ ГУМАНІТА́РНЫ УНІВЕРСІТЭ́Т, недзяржаўная вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1992 у Мінску. Арыентуецца на адукац. стандарты вядучых еўрап. і паўн.-амер. ун-таў. Рыхтуе эканамістаў, тэолагаў, псіхолагаў, філосафаў, мастацтвазнаўцаў, дызайнераў, прававедаў, палітолагаў і інш. У 1997/98 навуч. г. ф-ты: мастацтваў, права, эканомікі, псіхалогіі, тэалогіі, франка-бел. ф-т паліт. і адм. навук. Мае цэнтры: эканам. і сац. даследаванняў, амер., еўрап., гендэрных даследаванняў; б-ку і выд-ва.

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ ІНВЕСТЫЦЫ́ЙНЫ БАНК (European Investment Bank; ЕІБ), банк, створаны для падтрымкі праектаў, якія маюць значэнне для некалькіх краін — членаў *Еўрапейскай эканамічнай супольнасці*, а таксама для фінансавання больш адсталых еўрап. краін у выглядзе доўгатэрміновых крэдытаў. Дзейнічае з 1959. ЕІБ — інстытут з аўтаномным фін. статусам. Яго кіруючы орган — Савет упраўляючых у складзе міністраў фінансаў краін-удзельніц, які вызначае крэдытную палітыку, зацвярджае гадавыя балансы, прымае рашэнні аб выдачы крэдытаў і гарантый, аб выпуску пазык і памеры працэнтных ставак. Статутны капітал ЕІБ каля 15 млрд. ЭКЮ.

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ ПАРЛА́МЕНТ, Еўрапарламент, кансультатыўны і рэкамендацыйны орган *Еўрапейскага саюза* (ЕС). Створаны паводле Рым. дагавора (1957) пры заснаванні *Еўрапейскай эканамічнай супольнасці* (ЕЭС). Дэпутаты (626 чл.) з 1979 выбіраюцца на аснове прамога ўсеагульнага галасавання грамадзян краін — удзельніц ЕС (ЕЭС) тэрмінам на 5 гадоў. Месцазнаходжанне — г. Страсбур (Францыя). Е.п. удзельнічае ў абмеркаванні бюджэту ЕС, заканад. працэсе, кантралюе работу Камісіі і Савета ЕС. Кіруючы орган — прэзідыум (старшыня і 14 намеснікаў, 5 квестараў з дарадчымі галасамі), пастаянныя к-ты, падкамітэты, часовыя і следчыя к-ты рыхтуюць матэрыялы для пленарных пасяджэнняў Е.п. (праходзяць адкрыта кожны месяц). Пратаколы і тэксты рашэнняў распаўсюджваюцца на 9 еўрап. мовах. *С.Ф.Свілас.*

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ САЦЫЯ́ЛЬНЫ ФОНД (European Social Fund), фонд *Еўрапейскай эканамічнай супольнасці*, накіраваны на павышэнне занятасці ў краінах — членах Супольнасці праз аказанне фін. дапамогі ў перападрыхтоўцы і перасяленні рабочых. Засн. ў 1959; у выніку рэформы 1971 больш дакладна вызначаны прыярытэты яго дзейнасці. Фонд дае субсідыі для развіцця прафес. адукацыі, фінансавання праграм павышэння занятасці, развіцця галін, якія перажываюць спад, дапамогі ў працаўладкаванні імігрантам, жанчынам. Вялікая ўвага аддаецца фінансаванню праграм па ўладкаванні моладзі.

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ САЮ́З, (European Union; ЕС), саюз 15 еўрап. дзяржаў, створаны на аснове *Маастрыхцкага дагавора 1992* краінамі—членамі *Еўрапейскіх супольнасцей*: Бельгіяй, Вялікабрытаніяй, Германіяй, Грэцыяй, Даніяй, Ірландыяй, Іспаніяй, Італіяй, Люксембургам, Нідэрландамі, Партугаліяй, Францыяй. 1.1.1995 да яго далучыліся Аўстрыя, Фінляндыя і Швецыя. Дзейнічае з 1.11.1993. Мэта ЕС — стварэнне эканам., валютнага і паліт. саюза, а таксама ўвядзенне агульнага грамадзянства. Эканам. саюз будзе рэалізаваны

шляхам правядзення супольнай знешняй эканам. палітыкі, прыняццем агульных рэкамендацый па ўнутр. палітыцы краін-удзельніц, увядзеннем адзінага рынку і ліквідацыі ўсяляких абмежаванняў на перамяшчэнне людзей, паслуг, тавараў, капіталаў у межах ЕС. Паступова павінна быць уведзена бюджэтная дысцыпліна пад кантролем Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН. Рэалізацыя валютнага саюза плануецца шляхам стварэння Еўрап. валютнага ін-та, Еўрап. цэнтр. банка, абмежавання ваганняў валютных курсаў, рэгістрацыі біржавых каціровак у ЭКЮ і ўвядзення адзінай валюты на тэр. ЕС (да 1999). Замежная палітыка будзе рэалізоўвацца ў форме пастаянных кансультацый і шляхам выпрацоўкі адзінай пазіцыі краін-удзельніц ЕС. Значная ўвага аддаецца пытанням экалогіі, барацьбе са злачыннасцю, наркабізнесам і інш. Палітыка бяспекі распрацоўваецца сумесна з *Заходнееўрапейскім саюзам*. Грамадзянства ЕС не замяняе грамадзянства краін-удзельніц, яно забяспечвае права ўдзельнічаць у мясц. выбарах, выбарах у Еўрапарламент, звяртацца са скаргамі ў Еўрапарламент і да прадстаўніка ЕС па правах чалавека. Органы Еўрап. супольнасцей (Савет Еўропы, Савет Еўрапейскага саюза, Еўрапейская камісія, Еўрапейскі парламент, Еўрапейскі суд) аўтаматычна сталі органамі ЕС. *Н.К.Мазоўка.*

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ САЮ́З РАДЫЁВЯШЧА́ННЯ (ЕСР), міжнародная арганізацыя, заснаваная ў 1950 для каардынацыі дзейнасці краін Еўропы ў галіне радыёвяшчання. Аб'ядноўвае 103 тэлерадыёкампаніі з 80 краін (1997), з якіх 31 — нееўрапейская. У склад ЕСР у якасці асобнага дэпартамента ўваходзіць *Еўрабачанне*. З 1996 у ЕСР уваходзіць Беларусь.

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ ФОНД РАЗВІЦЦЯ́ (European Development Fund; ЕФР), спецыяльны фонд, засн. *Еўрапейскай эканамічнай супольнасцю* ў 1959 для аказання фін. і тэхн. дапамогі краінам, якія звязаны з Супольнасцю Рымскім дагаворам 1957: канвенцыямі Яўндэ і Ламе 1975. Забяспечвае бяспошлінны імпарт прамысл. прадукцыі з краін, якія сталі на шлях развіцця, і фін. дапамогу ў рэалізацыі праграм развіцця.

ЕЎРАПЕ́ЙСКІ ЦЭНТР ЯДЗЕРНЫХ ДАСЛЕ́ДАВАННЯЎ (франц. Conseil Européen pour la Recherche Nucleaire; ЦЕРН), міжнар. навук.-даследчая ўстанова 19 дзяржаў Еўропы (Аўстрыя, Вялікабрытанія, Іспанія, Італія, Францыя, ФРГ і інш.). Створана пры падтрымцы ЮНЕСКА у 1954 каля Жэневы (Швейцарыя, Францыя) для правядзення тэарэт. і эксперым. работ у галіне фізікі элементарных часціц (фізікі высокіх энергій). Мае 2 буйныя паскаральнікі элементарных часціц на сустрэчных пучках (калайдэры): супер пратонны сінхратрон на 450 ГэВ у пучку ў імпульсным рэжыме (з 1981) і вялікі электрон-пазітронны калайдэр на 90 ГэВ (з 1996). На іх базе будуецца самы буйны ў свеце паскаральнік — вялікі адронны калайдэр, разлічаны на энергію пратонаў да 5000 ГэВ у пучку (увод у дзеянне ў 2004). У распрацоўцы і стварэнні дэтэктарных сістэм для гэтага паскаральніка ўдзельнічаюць вучоныя розных н.-д. устаноў Беларусі ў адпаведнасці з дзярж. пагадненнем аб навук.-тэхн. супрацоўніцтве з ЦЕРН (1993). *А.А.Богуш.*

ЕЎРАПЕ́ЙСКІЯ СУПО́ЛЬНАСЦІ, агульная назва трох узаемазвязаных рэгіянальных эканам. арг-цый: *Еўрапейскага аб'яднання вугалю і сталі* (ЕАВС), *Еўрапейскай супольнасці па атамнай энергіі* (Еўратам) і *Еўрапейскай эканамічнай супольнасці* (ЕЭС), утвораных у 1951—57. У сістэму Е.с. уваходзяць таксама інш. еўрап. інтэграцыйныя ін-ты (*Еўрапейскі інвестыцыйны банк, Фонд еўрапейскага рэгіянальнага развіцця* і інш.). У 1965 паводле Брусельскага дагавора створаны адзіныя органы трох супольнасцей. З 1986 Е.с. выкарыстоўваюць уведзены ў 1955 Саветам Еўропы еўрап. сцяг, у 1972 ода «Да радасці» Л.Бетховена на словы Ф.Шылера зацверджана ў якасці еўрап. гімна. Паводле *Маастрыхцкіх пагадненняў 1992* Е.с. сталі афіц. называцца *Еўрапейскім саюзам*.

ЕЎРАПЕО́ІДНАЯ РА́СА, еўразійская раса, адна з асноўных або вялікіх рас чалавецтва, у якую ўваходзяць атланта-балт., балкана-каўказская, беламорска-балт., інда-міжземнаморская, сярэднееўрапейская малыя расы. Сфарміравалася на абшарах Зах., Цэнтр. і Усх. Еўропы, тэр. Каўказа, Пярэдняй, Паўд. і Паўд.-Усх. Азіі. У прадстаўнікоў гэтай расы скура ад светлых да смуглявых адценняў, вочы ад вельмі светлых да цёмных, валасы светлыя і цёмныя, прамыя ці хвалістыя, прыкметна растуць барада і вусы, нос вузкі, рэзка выступае, высокае пераноссе, тонкія вусны, рост ад нізкага да высокага. Малыя расы адрозніваюцца паміж сабой пігментацыяй вачэй і валасоў, формай носа. Сучаснае насельніцтва Беларусі адносіцца да ўсх.-балт. варыянта беламорска-балт. малой расы. Для яго характэрна шырокае тулава і кароткія ногі, сярэднешырокі і сярэдневысокі твар, умерана выступаючы нос. Сярод беларусаў вылучаюцца паўн. і паўд. варыянты. Апошні больш пігментаваны і нізкарослы.

Літ.: Тегако Л.И., Саливон И.И. Основы современной антропологии. Мн., 1989. *Л.І.Цягака.*

ЕЎРАРЫ́НАК, рынак еўравалют, міжнар. рынак пазыковых капіталаў, на якім аперацыі ажыццяўляюцца ў еўравалютах. Створаны ў Еўропе ў канцы 1950-х г. У якасці крэдытораў на Е. выступаюць пераважна прыватныя камерцыйныя банкі, а ў ролі пазычальнікаў — транснац. карпарацыі і дзяржавы, якія адчуваюць патрэбу ў замежнай валюце. Аперацыі Е. праводзяцца ў выглядзе кароткатэрміновых (да 18 месяцаў) крэдытаў.

ЕЎРА́ТАМ, гл. *Еўрапейская супольнасць па атамнай энергіі*.

ЕЎРО́ПА, у старажытнагрэчаскай міфалогіі багіня земляробства, дачка фінікійскага цара Агенора, сястра *Кадма*, маці Мінаса, Сарпедона і Радаманфа. Закаханы ў Е. *Зеўс* пад выглядам быка выкраў яе і пераплыў на Крыт, дзе Е. стала яго жонкай. Культ Е. існаваў у Фінікіі і на Крыце. Выкраданне Е. — часты сюжэт у выяўл. мастацтве (ант. вазапіс, рым. мазаіка, фрэскі ў Пампеях, карціны К. Ларэна, Рафаэля, Тыцыяна і інш.).

Да арт. **Еўропа**. Выкраданне Еўропы. Мастак В.А.Сяроў. 1910.

ЕЎРО́ПА, частка свету, зах. ч. мацерыка *Еўразія*. Пл. каля 10 млн. км^2, у т.л. пл. астравоў каля 730 тыс. км^2. Крайнія пункты кантынентальнай Е.: на Пн — мыс Нордкін, 71°08 паўн. ш., на Пд — мыс Маракі, 36° паўн. ш., на З — мыс Рока, 9°34 зах. д., на У — Палярны Урал (паблізу Байдарацкай губы), 67°30 усх. д. Мяжу з Азіяй умоўна праводзяць па ўсх. падножжы Урала, рэках Эмба, Каспійскім м., рэках Кума і Маныч, Азоўскім, Чорным і Мармуровым морах, прал. Басфор і Дарданелы. Абмываецца морамі Паўн. Ледавітага і Атлантычнага ак.: на Пн і ПнЗ Карскім, Баранцавым, Белым і Нарвежскім, на З — Балтыйскім і Паўночным, на Пд — Міжземным, Мармуровым, Чорным і Азоўскім, на ПдУ бяссцёкавым возерам Каспійскім морам. Берагі моцна парэзаныя, асабліва на З і Пд. Даўж. берагавой лініі каля 38 тыс. км. На долю паўастравоў прыпадае каля $^1/_4$ тэрыторыі, самыя вялікія Кольскі, Скандынаўскі, Пірэнейскі, Апенінскі, Балканскі. Найб. а-вы: Новая Зямля, Ісландыя, Вялікабрытанія, Ірландыя, Корсіка, Сардзінія, Сіцылія, Крыт. Найб. аддаленасць ад мораў каля 1600 км.

Рэльеф. Па сярэдняй (каля 300 м) і максімальнай вышыні (г. Манблан — 4807 м) Е. саступае інш. часткам свету, акрамя Аўстраліі. У будове паверхні пе-

ЕЎРОПА

на зах. ад Грынвіча 0°
на ўсх. ад Грынвіча
В. ГРЭНЛАНДЫЯ (Дан.)
Шпіцберген (Нарв.)
Зямля Францыска-Іосіфа
Новая Зямля
п-аў Ямал
п-аў Таймыр
Паўночны палярны круг
Фарэрскія а-вы (Дан.)
Шэтлендскія (Брыт.) а-вы
Гебрыдскія а-вы
Арнейскія а-вы
Ісландыя
Рэйк'явік
Осла
Стакгольм
Хельсінкі
Санкт-Пецярбург
Талін
Рыга
Вільнюс
Мінск
Масква
Варшава
Берлін
Прага
Вена
Будапешт
Кішынёў
Бухарэст
Сафія
Белград
Загреб
Любляна
Сараева
Скоп'е
Тырана
Афіны
Стамбул
Анкара
Трыпалі
Бенгазі
Каір
Валета
Мальта
Алжыр
Туніс
Рым
Мадрыд
Лісабон
Парыж
Брусель
Амстэрдам
Люксембург
Берн
Лондан
Дублін
Эдынбург
Белфаст
Осла
Стакгольм
Хельсінкі
Берлін
Варшава
Прага
Вена
Будапешт
Кішынёў
Бухарэст
Сафія
Белград
Загреб
Любляна
Сараева
Скоп'е
Тырана
Афіны
Стамбул
Анкара
Трыпалі
Бенгазі
Каір
Валета
Мальта
Алжыр
Туніс
Рым
Мадрыд
Лісабон
Парыж
Брусель
Амстэрдам
Люксембург
Берн
Лондан
Дублін
Эдынбург
Белфаст
Масква
Санкт-Пецярбург
Мінск
Кіеў
Львоў
Адэса
Севастопаль
Сімферопаль
Растоў на Дону
Волгаград
Самара
Казань
Екацярынбург
Пермь
Уфа
Челябінск
Екібастуз
Астрахань
Краснадар
Сочы
Грозны
Махачкала
Тбілісі
Ерэван
Баку
Батумі
Трабзон
Сівас
Газіантэп
Конья
Ізмір
Бурса
Салонікі
Варна
Канстанца
Плоўдзіў
Сплит
Венецыя
Марсель
Барселона
Валенсія
Картахена
Малага
Гібралтар (Брыт.)
Танжэр
Аран
Анаба
Джэльфа
Тугурт
Габес
Бешар
Абадла
Сфакс
Сірт
Бенгазі
Бенгазі
Бенгазі

раважаюць раўніны. Горы займаюць каля 17% тэр. Палавіну плошчы займае Усходне-Еўрапейская (Руская) раўніна і яе працяг на З — Сярэднееўрапейская раўніна. На раўнінах ёсць узвышшы да 300—400 м над узр. м. (Сярэднярускае, Прыволжскае, Валынскае, Падольскае, Валдайскае і інш.) і нізіны да 150—200 м (Прычарнаморская, Прыдняпроўская, Прыкаспійская і інш.). Для паўн. ч. характэрны ледавікова-акумуляцыйныя і водна-ледавіковыя формы рэльефу. У цэнтр. і паўд. ч. Рускай раўніны пераважаюць эразійнарасчлянёныя паверхні (яры, лагчыны і інш.). На Пд — маладыя марскія акумуляцыйныя нізіны — Прычарнаморская і Прыкаспійская. Найб. значныя горы: Альпы, Карпаты, Пірэнеі, Апеніны, Скандынаўскія, горы Балканскага п-ва (Радопы, Рыла, Пірын). Уздоўж усх. граніцы — Уральскія горы. Да Е. зрэдку адносяць Каўказ. Дзеючыя вулканы ёсць у Ісландыі (Гекла, Лакі, Аск'я) і Міжземнамор'і (Этна, Везувій, на Ліпарскіх а-вах і в-вах Тыра).

Геалагічная будова. У фундаменце Е. ляжыць Еўрап. платформа, якая займае ўсю Усх. Е. і паўн.-зах. ч. Зах. Е.

На большай ч. платформы дакембрыйскі крышт. фундамент перакрыты гарызантальна залягаючымі асадкавымі пародамі магутнасцю ад 1—2 да 5 км. З З і ПнЗ платформу акаймоўваюць каледонскія структуры (Скандынаўскія горы, Паўн.-Шатландскае нагор'е, Паўд.-Шатландскае ўзв., горы Уэльса). На У Еўрап. платформа абмежавана Уральскімі гарамі герцынскага ўзросту. Шырока прадстаўлены герцыніды ў Зах. Е.: Пд Брытанскіх а-воў, Цэнтр. Французскі масіў, Вагезы, Шварцвальд, Рэйнскія Сланцавыя горы, Чэшскі масіў з Судэтамі, Руднымі гарамі, Шумавай, Чэшскі Лес і Калецка-Сандамірскі краж. З Пд герцыніды акаймоўваюць маладым альпійскім поясам (Альпы, Карпаты, Стара-Планіна). На Пд Е. альпійскія структуры прадстаўлены Андалускімі, Пірэнейскімі, Апенінскімі гарамі, Дынарскім нагор'ем, Паўн.-Албанскімі Альпамі, хр. Пінд, горнымі ўтварэннямі на астравах. Перадгорныя прагіны займаюць Паданская і Ніжнедунайская раўніны. Значную ролю ў геалаг. гісторыі Е. мелі чацвярцічныя зледзяненні. Асноўнымі цэнтрамі фарміравання ледавіковага покрыва былі Фенаскандыя і Шатландыя. Ледавікі пакінулі ледавікова-экзарцыйныя і ледавікова-акумуляцыйныя формы рэльефу. Чацвярцічныя зледзяненні адзначаліся і ў гарах на Пд.

Карысныя выкапні. У Е. буйныя радовішчы нафты і прыроднага газу (шэльф Паўночнага м., перадгор'і Каўказа, Волга-Уральская нафтагазаносная вобл., Прыкаспійская нізіна), каменнага вугалю (в-аў Вялікабрытанія, Рурскі, Верхнесілезскі, Данецкі, Пячорскі басейны), жал. (Скандынаўскі і Кольскі п-вы, Латарынгія, Курская магнітная анамалія, Крывы Рог, Керч), марганцавых (Нікапаль), алюмініевых (Кольскі п-аў, Венгрыя, Грэцыя), поліметал. (Германія, Іспанія, Балгарыя, Польшча), нікелевых, кобальтавых, медных руд. Германія, Беларусь і Францыя багатыя калійнымі солямі. Ёсць кухонная соль, разнастайныя буд. матэрыялы і інш.

Да арт. **Еўропа**. Мінскае ўзвышша ў нава коллі Мінска.

Да арт. **Еўропа**. Тыповы ландшафт на Скандынаўскім паўвостраве.

Клімат. Е. знаходзіцца ў 4 кліматычных паясах: арктычным, субарктычным, умераным і субтрапічным. Розная аддаленасць ад акіянаў і ўплыў рэльефу абумоўліваюць ваганні кліматычных умоў. Цыркуляцыя паветр. мас вызначаецца цэнтрамі атм. ціску: Ісландскім мінімумам, Азорскім і Азіяцкім максімумамі, арктычным поясам высокага ціску.

Найб. тэрыторыі ляжаць ва ўмераным поясе, для якога характэрны заходні перанос паветра. З-за ўплыву цёплых атл. паветр. мас большая ч. Зах. Е. мае акіянічны клімат. У студз. тут дадатныя т-ры паветра (да 6 °С). Пры руху на У павялічваецца кантынентальнасць, паветра выхалоджваецца, ва Усх. Е.

Да арт. **Еўропа**. Краявід у цэнтральнай частцы востраў Сіцылія.

часта пранікае арктычнае паветра. Гэта выклікае паніжэнне т-р да -10, -24 °С. Ва Усх. Е. ўтвараецца ўстойлівае снегавое покрыва на 4—8 месяцаў. Летам тэрмічны рэжым у асноўным адпавядае занальнаму размеркаванню сонечнага цяпла. На Пн Е. т-ра самага цёплага месяца (ліпень—жнівень) 5 °С. Самыя высокія т-ры адзначаюцца ў Міжземнамор'і (26—28 °С). Колькасць ападкаў ад 1000—1500 мм на З да 400 мм на У. Найменш іх выпадае ў Прыкаспійскай нізіне — 150—200 мм. Найб. колькасць ападкаў на З выпадае ўвосень і ў пачатку зімы, на У улетку, у Паўд. Е. — зімой.

Унутраныя воды. Па велічыні слоя сцёку (каля 300 мм) Е. займае 2-е месца пасля Паўд. Амерыкі, але з-за малых памераў сушы аб'ём сцёку невялікі (каля 2950 км^2 за год). Е. багатая павярхневымі водамі. Большасць рэк належыць да бас. Атлантычнага ак. або яго мораў (Нява, Зах. Дзвіна, Нёман, Вісла, Одра, Эльба, Рэйн, Сена, Луара, Гарона, Дуэра, Таха, Эбра, Рона, По, Дунай, Дняпро, Дон). Самая доўгая р. Волга ўпадае ў Каспійскае м. Да бас. Паўн. Ледавітага ак. адносяцца Пячора і Паўн. Дзвіна. Большасць рэк мае павольнае цячэнне, малыя нахілы рэчышчаў, моцнае меандраванне. Для іх рэжыму характэрны веснавы максімум, летне-асенні і зімовы мінімумы, зімовы ледастаў. Не замярзаюць толькі рэкі на крайнім З і Пд. Большасць рэк суднаходныя, многія з іх злучаны паміж сабой каналамі. Рэкі Паўд. Е. з'яўляюцца важнай крыніцай арашэння. Многія рэкі выкарыстоўваюцца ў гідраэнергет. мэтах. Буйныя вадасховішчы на Волзе, Дняпры, Доне. Шмат азёр у раёнах чацвярцічнага зледзянення. Найбольшыя з іх — Ладажскае (пл. 18,4 тыс. км^2), Анежскае (9,9 тыс. км^2), Венерн, Ветэрн, Меларэн, Ельмарэн, Інары, Імандра — маюць ледавікова-тэктанічнае паходжанне. Шмат запрудных ледавіковых азёр: Сайма, Мюрыц, Снярдвы, Мамры. Каля падножжа Альпаў падпруджаныя стараж. марэнамі далінных ледавікоў азёры Жэнеўскае, Фірвальдштэцкае, Кома, Гарда, Лага-Маджорэ. Ёсць тэктанічныя, вулканічныя і карставыя азёры. У лясной зоне шмат балот. Агульная пл. сучасных ледавікоў каля 100 тыс. км^2, у т.л. на астравах Арктыкі (каля 75 тыс. км^2), у Ісландыі (11,8 тыс. км^2), Скандынаўскіх гарах (5 тыс. км^2), Альпах (3,2 тыс. км^2).

Глебы і расліннасць. На раўнінах Усх. Е. добра акрэслена шыротная занальнасць глеб і расліннасці; у гарах вышынная пояснасць. На астравах Паўн. Ледавітага ак. — арктычныя пустыні з мохава-лішайнікавай расліннасцю на маламагутных арктычных глебах. На Пн Усх.-Еўрап. раўніны і Фенаскандыі — тундравая зона з мохава-лішайнікавым і хмызняковым покрывам, якая на Пд пераходзіць у лесатундру; глебы тундравыя, глеевыя, часткова ападзоленыя. На Пд да Ладажскага воз. і Паўн. Увалаў, а таксама на большай ч. Фенаскандыі — ялова-піхтавыя, хваёвыя і лістоўнічныя таежныя лясы на падзолістых моцна забалочаных глебах. Мяшаныя (хвойна-шыракалістыя) лясы займаюць Пн Вялікабрытаніі, Пд Скандынавіі, У Сярэднееўрап. раўніны, а на Рус. раўніне дасягаюць 52—54 паўн. ш., паступова выкліньваюцца да Урала. Занальным тыпам глебы з'яўляюцца дзярнова-падзолістыя. Ва ўмовах акіянічнага ўмеранага клімату ў Зах. Еўропе пашыраны шыракалістыя лясы (бук, граб, каштан, на У — дуб). Пераважаюць бурыя лясныя глебы. На ўзбярэжжах развіваюцца верасоўнікі. У гарах вышынная пояснасць. У Альпах дубова-букавыя лясы перадгор'яў зменьваюцца хвойна-шыракалістымі лясамі сярэднягор'яў (да выш. 1700—2100 м). Вышэй субальпійскія і альпійскія лугі. Зоны лесастэпаў і стэпаў прымеркаваны да ўмоў умеранага кантынентальнага клімату на Прыдунайскіх раўнінах і на Пд Рус. раўніны. Пераважаюць разнатраўна-злакавыя і злакавыя стэпы на чарназёмных і каштанавых глебах. На Пд Ніжняга Паволжа пашыраны паўпустыні з перавагай ксерафітных хмызнякоў, салянак, палыноў. У міжземнаморскім клімаце атрымала развіццё зона вечназялёных субтрапічных ксерафітных лясоў (каменны і коркавы дуб, італьян. хвоя і інш.) і ксерафітныя фармацыі з вечназялёных і лістападных хмызняковых; у гарах шыракалістыя і мяшаныя лясы.

Жывёльны свет. Тэр. Е. ўваходзіць у склад Арктычнай (у межах арктычнай, тундравай і лесатундравай зон), Еўрап.-Сіб. (з лясной, лесастэпавай і стэпавай зонамі) і Міжземнаморскай падабласцей Палеаарктычнай біягеагр. вобласці. Самы бедны відамі жывёльны свет на паўн. акіянічных узбярэжжах і ў зоне тундры (пясец, гарнастай, паўн. алень, лемінгі, з птушак — палярная сава і курапатка, гусі, качкі і інш.). На ўзбярэжжах трапляецца белы мядзведзь, у морах маржы, цюлені, розныя віды рыб. Для лясной зоны характэрны лось, дзік, ліс, воўк, буры мядзведзь, бабёр, заяц, з птушак — рабчыкі, глушцы, курапаткі. На У у лясах водзяцца собаль, расамаха, вавёрка, бурундук, лясная пяструш-

Да арт. **Еўропа.** Даліна Рэйна ў Германіі.

Да арт. **Еўропа.** Ландшафт у Падмаскоўі.

ка. У зах.-еўрап. лясах — высакародны алень, казуля, дзік, заяц. У лесастэпах і стэпах Е. пераважаюць суслікі, суркі, тушканчыкі, палёўкі, хамякі, на У трапляюцца сайгакі. У міжземнаморскай зоне — дзікабраз, вівера-генета, шматлікія птушкі (блакітная сарока, каменны дрозд, фламінга, белагаловы сіп, сівараронка), паўзуны і земнаводныя (яшчаркі, хамелеоны, чарапахі, вужы, гадзюкі і інш.), насякомыя. У гарах захаваліся горныя казлы, серны, муфлоны.

Насельніцтва. У Е. жыве больш за 700 млн. чал. Шчыльнасць нас. вагаецца ад 5 чал. у Паўн. Е. да 250—300 чал. у Цэнтр. Е. У некат. краінах (Нідэрланды, Бельгія) шчыльнасць перавышае 300 чал. на 1 км^2. У Е. самы высокі (73%) працэнт гар. насельніцтва (Бель-

гія — 97%, Ісландыя — 91, Вялікабрытанія і Нідэрланды — па 89, Германія — 86, Швецыя — 83%). Найб. нізкі працэнт гар. насельніцтва на ПдУ (Албанія — 37%, Югаславія — 47, Малдова — 50, Харватыя — 51%). У Е. 59 гарадоў з нас. больш за 1 млн. ж., Мінск знаходзіцца прыкладна на 30-м месцы. Найб. гарады Е.: Лондан, Парыж, Масква, Санкт-Пецярбург, Берлін. Для большасці краін Е. ў канцы 20 ст. характэрны нізкі прырост насельніцтва — каля 0,1—0,3% за год. У некат. краінах (Венгрыя, Украіна, Германія, Беларусь) натуральны прырост адмоўны. Насельніцтва Е. належыць да вял. еўрапеоіднай расы, большасць народаў гаворыць на мовах індаеўрап. сям'і. Славянская група моў гэтай сям'і падзяляецца на 3 падгрупы: усх. (беларусы, рускія, украінцы), зах. (палякі, чэхі, славакі, лужыцкія сербы), паўд. (балгары, сербы, харваты, славенцы, македонцы, баснійцы, чарнагорцы). Блізкія да славян мовай і культурай народы балт. моўнай групы — літоўцы і латышы. Паўн.-Зах. і Цэнтр. Е. насяляюць народы герм. моўнай групы, якая падзяляецца на паўн. (шведы, датчане, фарэрцы, нарвежцы, ісландцы) і зах. (немцы, аўстрыйцы, германа-швейцарцы, эльзасцы і латарынгцы, люксембуржцы, галандцы, фламандцы, фрызы, англічане, шатландцы, ольстэрцы) падгрупы. У Зах. і Паўд.-зах. Е. жывуць народы раманскай моўнай групы (італьянцы, французы, іспанцы, партугальцы, каталонцы, галісійцы, валоны, франка-швейцарцы, італа-швейцарцы, карсіканцы, рэтараманскія народы — фрыулы, ладзіны, раманшы). У раманскую групу таксама ўваходзяць блізкія да славян культурай малдаване, румыны, арамуны (влахі). Да кельцкай моўнай групы адносяцца ірландцы, уэльсцы (валійцы), гэлы, брэтонцы; асобныя моўныя групы складаюць албанцы і грэкі; цыганы належаць да інд. моўнай групы. На тэр. Е. жывуць народы уральскай сям'і: да фінскай групы гэтай сям'і адносяцца фіны, карэлы, эстонцы, лівы, іжорцы, вепсы, саамы, комі і комі-пермякі, удмурты, марыйцы, мардва, да угорскай — венгры, мансі, да самадыйскай — ненцы. У цюркскую моўную групу алтайскай сям'і моў уваходзяць чувашы, татары, башкіры, туркі, гагаузы, у мангольскую — калмыкі. Адасобленае становішча займаюць баскі, якія жывуць на ўзбярэжжы Біскайскага зал. ў Францыі і Іспаніі. Да семіта-хамітскай моўнай сям'і належаць мальтыйцы. Яўрэі карыстаюцца мовамі тых народаў, сярод якіх жывуць, і мовамі ідыш і іўрыт. Е. — радзіма 2 асноўных галін хрысціянства — праваслаўя і каталіцтва, а таксама шматлікіх пратэстанцкіх цэркваў і плыней, якія ўзніклі ў 16—17 ст. Большасць веруючага насельніцтва Е. вызнае хрысціянства: праваслаўе (усх. і паўд. славяне, усх.-раманскія народы, грэкі, мардва, удмурты і інш.), каталіцызм (амаль усе раманскія народы, зах. славяне, ч. паўд. славян, літоўцы, ірландцы, аўстрыйцы, фламандцы, венгры, ч. немцаў і інш.), пратэстанцтва (палавіна немцаў, галандцы, англічане, шатландцы, уэльсцы, датчане, шведы, нарвежцы, фіны). Частка насельніцтва Е. (туркі, татары, башкіры, казахі, ч. баснійцаў, большасць албанцаў, выхадцы з мусульманскіх краін) вызнае іслам. Невял. групы насельніцтва вызнаюць іудаізм (яўрэі), будызм (калмыкі) і інш.

Палітычны падзел. На тэр. Е. размешчаны дзяржавы: Албанія, Андора, Аўстрыя, Балгарыя, Беларусь, Бельгія, Боснія і Герцагавіна (складаецца з 2 самаст. ч.), Ватыкан, Вялікабрытанія, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Ісландыя, Іспанія, Італія, Казахстан (еўрап. частка), Латвія, Літва, Ліхтэнштэйн, Люксембург, Македонія, Малдова, Мальта, Манака, Нарвегія, Нідэрланды, Партугалія, Польшча, Расія (еўрап. частка), Румынія, Сан-Марына, Славакія, Славенія, Турцыя (еўрап. частка), Украіна, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эстонія, Югаславія; Гібралтар — уладанне Вялікабрытаніі, Фарэрскія а-вы — аўтаномная ч. Даніі. Пра кожную дзяржаву і ўладанне гл. асобны артыкул. *М.В.Лаўрыновіч.*

ЕЎРО́ПА, спадарожнік планеты *Юпітэр*. Дыяметр 3140 км, сярэдняя адлегласць ад цэнтра планеты 670,9 тыс. км. Сідэрычны перыяд абарачэння 3 сут 13 гадз 18 мін. Мае атмасферу. Адзін з чатырох яркіх спадарожнікаў Юпітэра. Адкрыў Г.Галілей (1610).

ЕЎРОПАЦЭНТРЫ́ЗМ, прынцып і пазіцыя, паводле якіх падзеі ў свеце разглядаюцца і ацэньваюцца з еўрап. пункту гледжання. Мае месца ў філасофіі гісторыі і культуры, тэорыі развіцця грамадства, паліталогіі і інш. грамадскіх навуках, а таксама ў палітыцы. Характэрная рыса Е. — абсалютызацыя еўрап. вопыту развіцця як узораў для нееўрап. народаў. Рысы Е. заўважаюцца ўжо ў Стараж. Грэцыі і Рыме. *Платон*, напр., лічыў грэч. поліс (горад-дзяржава) ідэальнай формай дзярж. ўладкавання. У сярэдневякоўі на Е. абапіралася ідэалогія каталіцызму, якая абвяшчала Ватыкан духоўным цэнтрам зямлі і вяла барацьбу супраць інш. рэлігій. У 19 і 20 ст. еўропацэнтрычныя ідэі пэўным чынам паўплывалі на філасофію Г.*Гегеля*, на тэорыі цывілізацый і культур О.*Шпенглера* і А.*Тойнбі*. Элементы Е. ёсць і ў сучасных тэорыях грамадскага развіцця, дзе падкрэсліваецца вядучае значэнне еўрап. вопыту навук.-тэхн., тэхнал. і сац.-культ. прагрэсу.

Літ.: Семенов Ю.Н. Социальная философия А.Тойнби. М., 1980; Данилевский Н.Я. Россия и Европа. М., 1991.

В.І.Боўш.

ЕЎРО́ПІЙ (лац. Europium), Eu, хімічны элемент III групы перыяд. сістэмы, ат. н. 63, ат. м. 151,96, адносіцца да *лантаноідаў*. У прыродзе 2 стабільныя ізатопы ^{151}Eu (47,82%) і ^{153}Eu (52,18%). У зямной кары $1{,}3 \cdot 10^{-4}$% па масе. Адкрыты ў 1901 франц. хімікам Э.Дэмарсэ.

Серабрыста-белы метал, $t_{пл}$ 826 °С, шчыльн. 5245 кг/м^3. У паветры хутка акісляецца (захоўваюць у вакууме ці інертным асяроддзі), узаемадзейнічае з вадой і мінер. кіслотамі, пры награванні — з галагенамі, азотам, вадародам. Выкарыстоўваюць як паглынальнік нейтронаў у ядз. тэхніцы, актыватар люмінафораў у каляровым тэлебачанні.

Ф.Ф.Еўстаф'еў.



Я.А.Еўтушэнка.

ЕЎРЫПІ́Д, гл. *Эўрыпід*.

ЕЎСТАФ'ЕЎ Серафім Фёдаравіч (н. 2.1.1914, г. Чыятура, Грузія), бел. інжынер. Сын Ф.Ф.*Еўстаф'ева*. Скончыў Бел. лесатэхн. ін-т (1940). З 1950 у Ін-це торфу АН Беларусі, у 1954—70 у БПІ. Сканструяваў пнеўматычны барабан для перакочвання цыліндрычнага торфу пры яго сушцы, воданаліўны каток для ўшчыльнення грунту. Распрацаваў тэорыю праектавання і выяўленне на чарцяжах святлоценявых форм. Аўтар успамінаў пра Ф.Ф.Еўстаф'ева.

ЕЎСТАФ'ЕЎ Фёдар Фёдаравіч (12.10.1862, г. Трубчэўск Бранскай вобл., Расія — 21.1.1941), бел. вынаходнік. Герой Працы (1928). З 1903 працаваў у Гомельскім чыг. дэпо. Вынайшаў лятальны апарат верт. ўзлёту — гелікаптэр, макет якога экспанаваўся на Екацярынаслаўскай прамысл. выстаўцы ў 1909, прыстасаванне для прадзімання дымагарных труб паравозных катлоў, дамкрат для падымання вагонаў, іскраўлоўнік на паравозах, эстакаду для падачы вугалю на паравозы і інш. З 1922 займаўся распрацоўкай праекта вінтаплана (верталёта) для перавозкі пасажыраў.

Літ.: Дегтев В. Крылья Белоруссии. Мн., 1973. С. 16—17.

ЕЎСЦІГНЕ́ЕЎ Віктар Уладзіміравіч (н. 30.8.1941, в. Сукманаўка Тамбоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне неўралогіі. Д-р мед.н. (1991), праф. (1994). Акад. Каралеўскай акадэміі дактароў Іспаніі (1993). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1966). У 1969—83 і з 1994 працуе ў ім, у 1983—94 у Бел. дзярж. ін-це ўдасканалення ўрачоў. Навук. працы па праблемах эпілепсіі і яе хірург. лячэння. Адзін з аўтараў адкрыцця «Заканамернасці змянення ўласных акустычных ваганняў галаўнога мозга» (1991), рас-

працоўкі сістэмы камп'ютэрнай дыягностыкі вострых хвароб ц.н.с. і метаду рэдыслакацыі мазгавога ствала ў выпадках яго зрушвання і пры ўшчамленнях, абумоўленых унутрычарапной гіпертэнзіяй.

Тв.: Смещения и ущемления мозгового ствола. Мн., 1968 (разам з М.С.Місюком, С.М.Рагульчанкам); Острая внутричерепная гипертензия. Мн., 1974 (разам з А.Я.Семаком); Основы топической диагностики заболеваний нервной системы. Мн., 1974 (у сааўт.); Нервные болезни. Мн., 1977 (разам з М.С.Місюком, А.М.Гурленем).

ЕЎСЦІГНЕЕЎ Яўген Аляксандравіч (9.10.1926, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 4.3.1992), рускі акцёр. Нар. арт. СССР (1983). Скончыў Ніжагародскае тэатр. вучылішча (1951) і Школу-студыю МХАТ (1956; з 1983 праф. у ёй). У 1957—70 у Маск. т-ры «Сучаснік». З 1971 у МХАТ (з 1989 у МХАТ імя А.Чэхава). Яго мастацтву ўласцівы тонкасць псіхал. аналізу, трапнасць сац.-быт. характарыстыкі персанажа, разнастайнасць фарбаў (ад лірыкі да едкага сарказму): Кароль («Голы кароль» Я.Шварца), Серабракоў, Фірс, Шабельскі («Дзядзька Ваня», «Вішнёвы сад», «Іванаў» Чэхава), Пётр Хромаў («Сталяры» Г.Бокарава, Дзярж. прэмія СССР 1974). З 1957 здымаўся ў кіна- і тэлефільмах: «Сцеражыся аўтамабіля», «Бег», «Старыя-разбойнікі», «Дзямідавы», «Па сямейных абставінах», «Месца сустрэчы змяніць нельга», «Семнаццаць імгненняў вясны» і інш.

ЕЎСЯГНЕЕЎ Раман Аляксандравіч (н. 25.6.1951, Мінск), бел. вучоны ў галіне псіхіятрыі. Д-р мед. н. (1991), праф. (1996). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1974). З 1980 працаваў у ім, з 1995 у Бел. дзярж. ін-це ўдасканалення ўрачоў (заг. кафедры). Навук. працы па вывучэнні біял. механізмаў афектыўных расстройстваў, магчымасцей іх індывід. прагнозу і тэрапіі. З 1994 старшыня праўлення Бел. псіхіятрычнай асацыяцыі.

Тв.: Практическое пособие по психиатрии. Мн., 1991 (разам з Ф.М.Гайдуком, Т.Ц.Сарокінай).

ЕЎТУШЭ́НКА Яўген Аляксандравіч (н. 18.7.1933, г. Зіма Іркуцкай вобл., Расія), рускі паэт. Вучыўся ў Літ. ін-це імя М.Горкага (1951—54). Друкуецца з 1949. Паэзія вызначаецца незалежнасцю пазіцыі, вострай пастаноўкай складаных маральных і сац. пытанняў, праблем грамадзянскасці, міжнар. палітыкі, гуманіст. і антываен. пафасам (зб-кі «Разведчыкі будучага», 1952, «Шаша энтузіястаў», 1956, «Яблык», 1960, «Інтымная лірыка», 1973, «Зварка выбухам», 1980, «Грамадзяне, паслухайце мяне...», 1989, і інш., паэмы «Брацкая ГЭС», 1965, «Мама і нейтронная бомба», 1982, за апошнюю Дзярж. прэмія СССР 1984). Выступае як празаік, публіцыст і крытык (зб-кі артыкулаў «Талент ёсць цуд невыпадковы», 1980, «Пункт апоры», 1981, раманы «Ягадныя мясціны», 1982, «Не памірай пасля смерці», 1993). Паставіў фільмы «Дзіцячы сад» (1984), «Пахаванне Сталіна» (1991), здымаўся ў іх. На бел. мову творы Е. перакладалі Р.Барадулін, А.Вольскі, А.Вярцінскі, В.Макарэвіч, У.Нядзведскі і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1983—84; Нет лет. СПб., 1993; Мое самое-самое. М., 1995.

ЕЎТЭ́РПА, у старажытнагрэчаскай міфалогіі адна з 9 муз, апякунка лірычнай паэзіі і музыкі, дачка *Зеўса* і *Мнемасіны*, маці фракійскага цара Рэса. Е. ўяўлялі з двайной флейтай.

ЕЎФРА́Т, араб. Шат-эль-Фурат, рака ў Турцыі, Сірыі і Іраку, самая вял. ў Зах. Азіі. Даўж. (ад вытоку р. Мурат) 3065 км, ад сутокаў рэк Мурат і Курасу 2700 км, пл. басейна 673 тыс. км^2. Пачынаецца ў гарах Армянскага нагор'я. У верхнім цячэнні праразае хрыбты Армянскага нагор'я Малацья і Эргані ў вузкай цясніне, потым цячэ ў глыбокай даліне па пустынным плато Джэзірэ, у ніжнім цячэнні — па Месапатамскай нізіне. Пасля зліцця з р. Тыгр утварае р. Шат-эль-Араб, якая ўпадае ў Персідскі заліў. Гал. прытокі: Тахма, Гёксу (справа), Беліх, Хабур (злева), упадаюць у Е. у верхнім і сярэднім цячэнні; у Іраку да Е. падыходзяць толькі сухія даліны — вадзі, якія запаўняюцца вадой пасля моцных дажджоў. Жыўленне снегавадажджавое. Веснавое разводдзе і летняя межань. У ніжнім цячэнні рэчышча абвалавана ад разводдзяў. Сярэдні гадавы расход вады каля г. Хіт (Ірак) 840 м^3/с, у ніжнім цячэнні памяншаецца да 300—400 м^3/с ад выпарэння і выкарыстання вады на арашэнне (уздоўж берагоў Е. на Месапатамскай нізіне — паласа аазісаў). Суднаходная да г. Хіт. На рацэ вадасховішча Кебан, Атацюрк (Турцыя), Эль-Асад (Сірыя). На Е. — гарады Біреджык (Турцыя), Рака, Дэйр-эз-Зор (Сірыя), Рамады, Эль-Фалуджа, Эль-Куфа, Эс-Самава, Эн-Насірыя (Ірак). Міжрэчча Е. і Тыгра — адзін са стараж. асяродкаў цывілізацыі, дзе знаходзіліся дзяржавы *Асірыя*, *Вавілонія*, *Шумер*; на беразе Е. быў размешчаны г. *Вавілон*.

ЕЎЦЫХЕ́ВІЧ Васіль Мікалаевіч (23.3.1911, в. Свяцілаўка Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 22.10.1980), бел. географ, глебазнавец. Канд. геагр. н. (1940). Скончыў Маскоўскі пед. ін-т (1937). У 1958—75 у Магілёўскім пед. ін-це. Даследаваў праблемы эрозіі глебагрунтоў, аховы прыроды, методыкі выкладання геаграфіі.

Тв.: Эрозия почвогрунтов и борьба с ней. Мн., 1973; Каков ты, хозяин земли? Мн., 1977; Зямля — наш дом. Мн., 1981.

ЕФРАСІ́ННЯ ПО́ЛАЦКАЯ [Еўфрасіння Полацкая, свецкае імя Прадслава; каля 1101 (не пазней 1104), Полацк — 23 або 25.5.1167], полацкая князёўна, асветніца, ігумення манастыра св. Спаса ў Полацку, бел. святая. Дачка малодшага сына кн. *Усяслава Брачыславіча* Святаслава-Георгія і Сафіі (?), дачкі Уладзіміра Манамаха. Калі дасягнула паўналецця (12 гадоў), адмовілася ад дынастычнага шлюбу і пайшла ў манастыр (пасля 1113). Пасля 1116 пасялілася ў келлі Полацкага Сафійскага сабора, дзе ў храмавым скрыпторыі перапісвала і, магчыма, перакладала кнігі, вяла актыўную міратворчую і асветніцкую дзейнасць. Пабудавала на свае сродкі 2 царквы ў Полацку, заснавала пад Полацкам жаночы і мужчынскі манастыры, якія сталі асяродкам асветы ў Полацкім княстве (працавалі вучыльні, бібліятэкі, скрыпторыі, багадзельня, верагодна, іканапісная і ювелірная майстэрні). Па яе заказе Лазар Богша зрабіў крыж (гл. *Крыж Ефрасінні Полацкай*). Мужчынскаму манастыру падаравала выдатны твор візант. мастацтва — абраз «Маці боская Адзігітрыя Эфеская». Паломнічала па святых мясцінах у Іерусалім (1167), дзе памерла і была пахавана ў манастыры св. Феадосія (недалёка ад Іерусаліма). У 1187 перапахавана ў Феадосіеву пячору Кіеўскай лаўры, у 1910 — у Полацк (у 1871 сюды была перанесена частка яе мошчаў). Першая жанчына, кананізаваная рус. правасл. царквой (1547). У спісах 16—18 ст. захаваліся царк. спевы пра Е.П. Адзіная крыніца біятр. звестак пра ігуменню — «Жыціе Ефрасінні Полацкай», дзе ўслаўляецца яе імкненне да ведаў і духоўнай дасканаласці, у строгай храналагічнай паслядоўнасці перадаюцца сапраўдныя гіст. факты (звесткі пра Полацк, яго культ. жыццё, побыт княжацкай сям'і). Е.П. прылічана да Сабора Бел. Святых (1984). Яе імя носяць цэрквы ў г. Саўт-Рывер (ЗША) і Таронта (Канада).

Ефрасіння Полацкая. Фрэска на сцяне Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. 12 ст.

Літ.: Титов Ф. Преподобная Ефросиния, княжна Полоцкая // Тр. Киевской духовной академии. 1910. Кн. 4; Арлоў У. Асветніца з роду Усяслава: Ефрасіння Полацкая. Мн., 1989; Яго ж. Таямніцы полацкай гісторыі. Мн., 1994; Мельников А.А. Путь непечален: Ист. свидетельства о святости Белой Руси. Мн., 1992. *А.А.Мельнікаў.*

ЕШЧАНКА Людміла Сямёнаўна (н. 5.4.1944, в. Пагост Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.), бел. хімік-неарганік.

Д-р тэхн. н. (1992), праф. (1993). Скончыла Бел. тэхнал. ін-т (1966). З 1966 у Бел. тэхнал. ун-це. Навук. працы па хіміі і тэхналогіі фасфатаў металаў. Распрацавала спосабы атрымання каталізатараў, сарбентаў, носьбітаў каталітычна актыўных рэчываў на аснове сітавінных матэрыялаў новага тыпу — ксерагеляў і каркасных (цэалітнага тыпу) фасфатаў металаў.

Тв.: Термическая стабильность и кислотостойкость алюмосиликофосфатных цеолитов (у сааўт.) // Изв. АН СССР. Сер. Неорганические материалы. 1986. Т. 22, № 11.

ЕШЫБО́Т (ад стараж.-яўр.), іудзейская вышэйшая рэліг. школа па падрыхтоўцы гал. чынам *рабінаў*. Е. ўзніклі ў Вавілоніі, Палесціне, Егіпце ў перыяд фарміравання *Талмуда*. Былі асн. цэнтрамі іудзейскай тэалагічнай думкі і месцам выхавання духоўнай і інтэлектуальнай эліты яўрэйства. У Е. прымалі юнакоў з 13 гадоў, якія скончылі хедэр (пач. школу). Утрымліваліся на ахвяраванні яўр. абшчын і прыватных асоб. Тэрмін навучання дакладна не быў вызначаны. Лекцыі чыталіся 2—3 разы ў тыдзень, выкладчыкі давалі агульныя кірункі, тлумачылі асобныя месцы і палажэнні Талмуда, астатні час вучні займаліся самастойна. У Беларусі Е. вядомы з 16 ст. Старэйшым лічыцца Е. у Брэсце. Найбольшыя Е. былі ў Валожыне, Лідзе, Міры, Слоніме, Слуцку, Радуні. Існавалі да 1930—40-х г., некаторыя іх будынкі (напр. у Валожыне, Міры) захаваліся.

Б.А.Мельцэр.

Ё

Ё, сёмая літара бел. і некаторых інш. слав. алфавітаў. Утворана шляхам спалучэння літары «е» з дыякрытычнымі знакамі. Запазычана з рус. графікі, дзе ўпершыню з'явілася ў 1797. У старабел. пісьменстве гук «о» пасля мяккіх зычных абазначаўся літарай «е» («медъ»), спалучэннем «іо» («ліосъ») і нават літарай «о» («всо»). У сучаснай бел. мове абазначае лабіялізаваны галосны «о» задняга раду сярэдняга пад'ёму і мяккасць папярэдняга зычнага («вёска» — в'оска»), а ў пач. слова, пасля галосных, «ў», «ь» і апострафа — 2 гукі («й» і «о»): «ёд» («йод»), «тваё» («твайо»), «пугаўё» («пугаўйо»), «мільён» («міл'йон»), «аб'ём» («абйом»). *А.М.Булыка.*

ЁГА (санскр. літар. сувязь, адзінства, сканцэнтраванне, намаганне), 1) вучэнне і метад кіравання псіхікай і фізіялогіяй чалавека; састаўны элемент рэліг. і філас. сістэм Індыі, якія ставяць за мэту дасягненне стану вызвалення (*нірваны*). Прызнае існаванне ў асобе неўсвядомленых сіл і магчымасцей кіравання імі (праз вызначаную арганізацыю псіхікі); распрацавана сістэма фіз. практыкаванняў. Ё. дасягнула поспехаў у кіраванні дыхальнымі і інш. фізіял. функцыямі арганізма, у рэалізацыі жаданых псіхічных станаў чалавека. Асн. філас. ідэя: суадносіны чалавечай псіхафізіялогіі і космасу. 2) Адна з 6 артадаксальных сістэм інд. філасофіі, якія прызнаюць аўтарытэт *вед* — стараж. помнікаў інд. рэліг. л-ры. Заснавальнік Патанджалі. Асэнсоўвае прыроду і функцыі метадаў Ё., этапы іх выкарыстання і інш. У агульнафілас. пытаннях прытрымліваецца вучэння санкх'і — адной з артадаксальных школ стараж.-інд. філасофіі.

ЁД (лац. Iodum), I, хімічны элемент VII групы перыяд. сістэмы, ат. н. 53, ат. м. 126,9045, адносіцца да *галагенаў*. У прыродзе 1 стабільны ізатоп ^{127}I. У зямной кары $4 \cdot 10^{-5}$% па масе, уласныя мінералы (напр., ёдаргірыт AgI) сустракаюцца рэдка. Прамысл. колькасць Ё. маюць падземныя воды нафтавых і газавых радовішчаў (0,01—0,1 кг/м^3), салетравых адкладаў (да 1%). Мікраэлемент неабходны для жыццядзейнасці жывёл і чалавека. Адкрыты ў 1811 франц. хімікам-тэхнолагам Б.Куртуа.

Ё. — чорна-фіялетавыя крышталі з металічным бляскам, $t_{пл}$ 113,5 °С, шчыльн. 4940 кг/м^3 (20 °С). Лёгка ўтварае фіялетавую пару (адсюль назва — грэч. iodēs фіялетавы), пры награванні сублімуе. Растваральнік ў бензоле, этаноле, эфіры, серавугляродзе, водных растворах ёдыдаў металаў; дрэнна — у вадзе. З кіслародам, серай, азотам непасрэдна не рэагуе. З фторам, хлорам, бромам утварае міжгалагенныя злучэнні (напр., Ё. пентафтарыд IF_5, цяжкая вадкасць, шчыльн. 3210 кг/м^3; Ё. трыхларыд ICl_3, жоўтыя крышталі, раскладаюцца пры 64 °С), з водным растворам аміяку — выбуховы ёдзісты азот NI_3. Вядомы шэраг кіслародзмяшчальных злучэнняў Ё. (напр., пентааксід дыёду I_2O_5, бясколерныя крышталі, раскладаюцца пры 300 °С; *ёднаватая кіслата* і інш.). Пры награнні ўзаемадзейнічае з вадародам (гл. *Ёдзісты вадарод*) і многімі металамі. Атрымліваюць з буравых вод акісленнем ёдыдаў хлорам. Выкарыстоўваюць для ёдыднага рафінавання металаў (тытану, цырконію і інш.), як каталізатар у арган. сінтэзе, у медыцыне як антысептык і антыпрэоідны сродак, радыеактыўныя ізатопы (^{125}I, ^{131}I, ^{132}I) для дыягностыкі і лячэння захворванняў шчытападобнай залозы. Атрутны, пара раздражняе слізістыя абалонкі, ГДК у паветры 1 мг/м^3. *І.В.Боднар.*

ЁДАФО́РМ, трыёдметан, арганічнае злучэнне, ёдвытворнае метану, CHI_3. Зеленавата-жоўтыя крышталі з непрыемным пахам, $t_{пл}$ 123 °С, шчыльн. 4008 кг/м^3 (20 °С). Дрэнна растваральнік ў вадзе, добра — у эфіры, хлараформе, воцатнай кіслаце. Выкарыстоўваюць як вонкавы антысептык у медыцыне.

ЁДЗІ, Ёдава, Едаўскае возера, у Астравецкім р-не Гродзенскай вобл., у бас. р. Страча, за 33 км на ПнУ ад г.п. Астравец. Уваходзіць у *Сарачанскую групу азёр*. Пл. 0,61 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 520 м, найб. глыб. 19,7 м; даўж. берагавой лініі каля 3,7 км. Пл. вадазбору 4,4 км^2. Схілы катлавіны выш. 6—10 м, разараныя, паўд. 8—15 м, пад лесам. Берагі зліваюцца са схіламі, на ПдУ і ПдЗ сплавінныя. Дно плоскае, да глыб. 2—4 м выслана пяском і апясчанымі адкладамі, ніжэй сапрапелі. Шыр. паласы расліннасці 10—40 м. Упадаюць 4 ручаі, на ПдУ злучана пратокай з воз. Гульбеза.

ЁДЗІСТАВАДАРО́ДНАЯ КІСЛАТА́, раствор *ёдзістага вадароду* ў вадзе, моцная к-та, HI. Бясколерная вадкасць з рэзкім пахам, у паветры пад уздзеяннем святла жаўцее (акісляецца з вылучэннем ёду). Найб. выкарыстоўваецца к-та, якая мае каля 47% (па масе) ёдзістага вадароду (шчыльн. 1500 кг/м^3). Утварае солі — *ёдыды*. Пры пападанні на скуру выклікае сверб і запаленне.

ЁДЗІСТЫ ВАДАРО́Д, неарганічнае злучэнне ёду з вадародам, HI. Бясколерны ўдушлівы газ, дыміць у паветры, $t_{кіп}$ -35,36 °С, шчыльн. вадкага 2860 кг/м^3 (-50,8 °С). Добра растваральнік ў вадзе, водны раствор HI — *ёдзіставадародная кіслата*. Моцны аднаўляльнік. У прам-сці атрымліваюць узаемадзеяннем ёду і вадароду пры 500 °С у прысутнасці каталізатара. Выкарыстоўваюць у арган. сінтэзе і для атрымання ёдыдаў.

ЁДКІ, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл. на правым беразе р. Лідзея, каля аўтадарогі Ліда—Дзятлава. Цэнтр Трацякоўскага с/с і калгаса. За 4 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Ліда, 117 км ад Гродна. 985 ж., 321 двор (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, лазнева-пральны камбінат, аддз. сувязі.

ЁДНАВА́ТАЯ КІСЛАТА́, моцная неарган. к-та, HIO_3. Бясколерныя шклопадобныя крышталі, $t_{пл}$ 110 °С. Добра растваральнік ў вадзе. Солі HIO_3 — ёдаты раскладаюцца пры т-ры, вышэйшай за 400 °С, моцныя акісляльнікі (напр., ёдат калію KIO_3). Атрымліваюць у водных растворах акісленнем ёду канцэнтраванай азотнай к-той. Выкарыстоўваюць як матэрыял для гукаправодаў акустаоптычных прылад.

ЁДЫ, вёска ў Шаркаўшчынскім р-не Віцебскай вобл., на р. Густатка, на аўтадарозе Шаркаўшчына—Браслаў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на ПнЗ ад гар. пасёлка і чыг. ст. Шаркаўшчына, 238 км ад Віцебска, 483 ж., 188 двароў (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулато-

рыя, аптэка, аддз. сувязі. Царква, касцёл.

ЁДЫ́ДЫ неарганічныя, злучэнні ёду з інш. элементамі. Ё. многіх металаў — солі *ёдзіставадароднай кіслаты*. У прыродзе сустракаюцца ў выглядзе рэдкіх мінералаў (напр., маршыт CuI).

Ё. металаў I і II груп перыяд. сістэмы элементаў добра растваральныя ў вадзе (акрамя AgI, Cu_2I_2, Hg_2I_2, HgI_2), а III—VI груп і неметалаў (напр., Ё. крэмнію SiI_4, мыш'яку AsI_3) узаемадзейнічаюць з вадой (гідралізуюцца). Пры награванні лёгка дысацыіруюць на элемент і ёд. Атрымліваюць узаемадзеяннем элементаў з ёдам ці аксідаў або карбанатаў з ёдзіставадароднай к-той. Выкарыстоўваюць у медыцыне, арган. сінтэзе (Ё. калію і натрыю), як фотаматэрыялы і матэрыял для цвёрдых электралітаў, у выт-сці звышчыстых металаў (напр., тытану, гафнію і інш.).

ЁМІСТАСНАЕ СУПРАЦІЎЛЕ́ННЕ, велічыня, якая характарызуе супраціўленне пераменнаму току *электраёмістасці* ланцуга (яго ўчастка). Ё.с. сінусаідальнаму току $x_c=1/\omega C$, дзе ω — цыклічная (вуглавая) частата, C — ёмістасць ланцуга. У Міжнар. сістэме адзінак вымяраецца ў *омах*. Разам з *індуктыўным супраціўленнем* складае рэактыўнае супраціўленне, якое ўваходзіць у склад агульнага (поўнага) *электрычнага супраціўлення*.

ЁМІСТАСЦІ ВЫМЯРА́ЛЬНІК, электрычная прылада для вымярэння *электраёмістасці*. Найб. пашыраны Ё.в. маставыя (гл. *Мост вымяральны*) і лагаметрычныя (гл. *Фарадметр*). Ёмістасць вызначаюць таксама балістычным метадам вымярэнняў і з дапамогай некалькіх вымяральных прылад непрамым спосабам (метадамі трох вальтметраў, вальтметра — амперметра і інш.).



Схема **ёмістасці вымяральніка** паводле прынцыпу непасрэдных вымярэнняў: U_o — крыніца пераменнага напружання частатой f_o; C_o — узорная ёмістасць; C_x — ёмістасць, якая вымяраецца; *R*, *KH* — рэзістар і кнопка ўстаноўкі нуля.

ЁМІСТАСЦЬ АСЯРО́ДДЗЯ біялагічная, здольнасць прыроднага ці прыродна-антрапагеннага навакольля забяспечваць нармальную жыццядзейнасць пэўнай колькасці жывых арганізмаў ці іх згуртаванняў без адметных прыкмет парушэння ці дэградацыі самога навакольля. Залежыць ад ступені спрыяльнасці для жыцця біятычных і абіятычных фактараў прыроднага асяроддзя, уплыву антрапагеннага і лімітавальных фактараў. Велічыня Ё.а. непастаянная, зменьваецца ў часе і прасторы, што прадвызначае ваганні шчыльнасці і колькаснага складу папуляцый, адрозненні ў іх размеркаванні на тэрыторыях са знешне аднатыпнымі ўмовамі. Асобныя паказчыкі, што характарызуюць выключныя бакі Ё.а., — ёмістасць ландшафту, уголдзяў, рэкрэацыйная ёмістасць. Мэтанакіраванае антрапагеннае ўздзеянне можа істотна павялічваць Ё.а. для гасп.-каштоўных папуляцый ці змяншаць яе для папуляцый шкодных відаў. Улік паказчыкаў Ё.а. дае магчымасць больш мэтанакіравана планаваць гасп. дзейнасць (напр., у галінах паляўнічай і лясной гаспадаркі, аховы прыродных рэсурсаў) і праводзіць пэўныя мерапрыемствы па ахове прыроды.

ЁМІСТАСЦЬ ЭЛЕКТРЫ́ЧНАЯ, гл. *Электраёмістасць*.

ЁРШ БАЛО́НА, гл. *Джгір Балона*.

ЁРШ ЗВЫЧА́ЙНЫ, гл. ў арт. *Джгіры*.

ЁРШ-НАСА́Р, гл. ў арт. *Джгіры*.

ЁЎНЯ, традыцыйная гаспадарчая пабудова для прасушкі збожжавых культур, канапель і лёну. Звычайна квадратная зрубная пабудова з імшанымі сценамі, насыпной столлю і шчыльна падагнанымі дзвярамі. Мае печ (без коміна), прыстасаванні для прасушкі снапоў — жэрдкі, якія перамяшчаюцца па дзвюх бэльках, умацаваных на выш. каля 1 м ад падлогі. Ё. часцей будавалі каля гумна або ўнутры яго (без страхі). Пашырана на Віцебшчыне, Магілёўшчыне і часткова Гомельшчыне.

Ж

Ж, восьмая літара бел. і некат. інш. слав. алфавітаў. Паходзіць з кірыліцкай ж («жывеце»), што была ўтворана шляхам далучэння цэнтр. вертыкальнай рыскі да літары х («хер») або падаўжэння літары ʒ («зямля»). У старабел. пісьменстве абазначала гукі «ж», «ж'» (вежа», «жити»). Не мела лічбавага значэння. У 16 ст. акрамя рукапіснай набыла друкаваную форму. У сучаснай бел. мове абазначае шумны звонкі зацвярдзелы шчыльны пяроднеязычны зычны гук «ж» (жыта»), а перад глухімі зычнымі і на канцы слоў парны да яго па звонкасці і глухасці гук «ш» («нож—нош»). Уваходзіць у склад дыграфа «дж» («дажджы»). *А.М.Булыка.*

ЖА́БА-БЫК, жаба-вол (Rana catesbeiana), бясхвостае земнаводнае сям. жаб сапраўдных. Пашырана ва ўсх. ч. Паўн. Амерыкі ў кустовых зарасніках па берагах рэк і ручаёў з чыстай вадой. Завезена ў некат. краіны Паўд. Амерыкі і Японію.

Даўж. да 20 см, маса да 600 г. Цела аліўкава-бурае або аліўкава-зялёнае з вял. цёмна-бурымі або чорнымі плямамі. Добра плавае. Заднія канечнасці магутныя (даўж. да 2,5 см), з плавальнымі перапонкамі. Самцы выдаюць моцныя гукі, якія нагадваюць рык быка (адсюль назва). Апалонікі развіваюцца да 2 гадоў. Корміцца беспазваночнымі, рыбамі, жабамі, птушанятамі, дробнымі млекакормячымі. Аб'ект промыслу і развядзення; выкарыстоўваюць у ежу.

Жаба-бык.

ЖАБАЦІ́НСКІ Леанід Іванавіч (н. 28.1.1938, г.п. Краснаполле Сумскай вобл., Украіна), украінскі спартсмен (цяжкая атлетыка). Засл. майстар спорту (1964). Скончыў Харкаўскі пед. ін-т (1964). Алімпійскі чэмпіён (1964, 1968), чэмпіён свету (1965, 1966), чэмпіён Еўропы (1966, 1968), неаднаразовы чэмпіён СССР у 1964—69 у цяжкай вагавой катэгорыі. Устанавіў 17 сусв. рэкордаў.

ЖА́БЕРСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 17 — пач. 18 ст. Размяшчаўся за 3 км на ПнЗ ад в. Жабер Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл., на правым беразе р. Ясельда. Належаў кн. Вішнявецкім. Прамавугольнае ў плане ўмацаванне абкружана з трох бакоў вадзяным ровам (шыр. да 20 м, глыбіня 5 м), з захаду — ракой. Быў умацаваны высокім земляным валам з бастыёнамі на вуглах (пл. каля 1,5 га) і дубовым частаколам. З наваколлем злучаўся брамай і мостам. Замак разбураны ў час Паўн. вайны 1700—21. Збярогся фундамент брамы.

ЖА́БІНКА, рака ў Камянецкім і Жабінкаўскім р-нах Брэсцкай вобл., правы прыток р. Мухавец (бас. Зах. Бута). Даўж. 25 км. Пл. вадазбору 228 км^2. Пачынаецца за 2,5 км на ПнЗ ад в. Пелішча Камянецкага р-на. Цячэ па Прыбугскай раўніне. Рэчышча каналізавана на ўсім працягу. Верхняе цячэнне на працягу 10 км наз. канал Жабінка. Створаны сажалкі.

ЖА́БІНКА, горад, цэнтр Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл., пры ўпадзенні р. Жабінка ў Мухавец. За 30 км ад г. Брэст. Чыг. вузел (напрамкі на Брэст, Лунінец, Баранавічы), аўтадарогі на Брэст, Кобрын, Камянец. 12,5 тыс. ж. (1997).

Узнікла як чыг. ст. ў канцы 19 ст. ў сувязі з буд-вам чыг. Масква—Брэст. У 1890 — 282 ж., 30 двароў, гасцініца, пошта, царква, сінагога, 6 крам, 3 карчмы. У пач. 20 ст. дзейнічалі сукнавальня і тартак. З 1921 у складзе Польшчы, у Кобрынскім пав. Палескага ваяв. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 вёска, цэнтр Жабінкаўскага р-на. З 23.6.1941 да 21.7.1944 акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія загубілі ў Ж. і раёне 1764 чал. З 16.4.1952 гар. пасёлак, у 1959—62 у Камянецкім, у 1962—63 у Кобрынскім р-нах. У 1959 — 2,9 тыс. ж. З 23.12.1970 горад.

Асфальтабітумны з-д, прадпрыемствы харч. (найб. значны *Жабінкаўскі цукровы завод*), буд. прам-сці. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — Пакроўская царква (1885).

Літ.: Бензярук А. Наш край — Жабінкаўшчына. Брэст, 1996.

ЖА́БІНКАЎСКІ РАЁН, на З Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. Пл. 0,7 тыс. км^2. Нас. 25,7 тыс. чал. (1997), гарадскога 48,6%. Сярэдняя шчыльнасць 37 чал. на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. *Жабінка*, 98 сельскіх нас. пунктаў. Падзяляецца на 7 сельсаветаў: Азяцкі, Крыўлянскі, Ленінскі, Пятровіцкі, Сцяпанкаўскі, Хмелеўскі, Якаўчыцкі.

Раён размешчаны ў межах *Брэсцкага Палесся*, на Пн заходзіць *Прыбугская раўніна*. Паверхня нізінна-раўнінная, 80% тэр. на вышынях да 150 м. Найвыш. пункт 181 м (за 6 км на Пн ад в. Сцяпанкі). Карысныя выкапні: торф, суглінкі, буд. пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -4,6 °С, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 523 мм за

Горад **Жабінка**. Вуліца Кірава.

год. Вегетац. перыяд 205 сут. У цэнтр. ч. раёна з У на ПдЗ працякае р. Мухавец з прытокамі Рыта, Трасцяніца, Асілоўка, Палахва і Жабінка; меліярац. каналы Чорны Роў, Сяхновіцкі, Барысаўскі і інш. Пераважаюць глебы дзярнова-падзолістыя забалочаныя (36,6%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (33,8%), дзярнова-падзолістыя (18,5%). Пад лесам 18,8% тэр. Найб. лясістасць на Пд; лясы хваёвыя, бярозавыя і інш., штучныя насаджэнні складаюць 10%. Балоты займаюць 0,17% тэр. Найб. балотны масіў Гатча-Восаўскае на Пд. Заказнік мясц. значэння «Непакойчыцы», зона адпачынку Сасновы Бор, 5 помнікаў прыроды — 3 дубы чарэшчатыя, сасна веймутава, ліпа драбналістая.

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 46,7 тыс. га, з іх асушаных 23 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 10 калгасаў, 2 саўгасы, рыбгас «Сакалова». Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі. Вырошчваюць буракі, лён, збожжавыя і бульбу. Прадпрыемствы харч. (мясныя і хлебабулачныя вырабы, цукар, безалкагольныя напіткі), *Жабінкаўскі цукровы завод*; паліўнай (торфабрыкет); будматэрыялаў і камбікормавай прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Брэст—Мінск, Брэст—Гомель, аўтадарогі на Брэст, Кобрын, Камянец; нафтаправод «Дружба», транзітныя газаправоды. У раёне 9 сярэдніх, 3 базавыя, 5 пач., 3 муз. школы, 2 садкі-школы, 13 дашкольных устаноў, 25 клубаў, 26 б-к, 2 бальніцы, 13 фельч.-ак. пунктаў, санаторый «Буг». Помнікі архітэктуры: Мікалаеўская царква (пач. 20 ст.) у в. Азяты, Пакроўская царква (1761) у в. Арэпічы, Мікалаеўская царква (1727) у в. Вял. Сяхновічы, Мікітаўская царква (пач. 16 ст., перабудавана ў 1787) у в. Здзітава, царква (1720) у в. Маціевічы, Міхайлаўская царква (1780) у в. Сцяпанкі, Праабражэнская царква (1725) у в. Хмелева, Уладзімірская царква (1894) у в. Чыжэўшчына, рэшткі замка (17 ст.) у в. Крыўляны.



ЖАБІНКАЎСКІ ЦУКРО́ВЫ ЗАВО́Д. Пабудаваны ў 1963 у г. Жабінка. З 1996 адкрытае акцыянернае таварыства. З 1992 праводзіцца рэканструкцыя. У 1997 пабудаваны будынак ТЭЦ. Буйнейшае прадпрыемства на Беларусі па выт-сці цукру з цукр. буракоў і імпартнай сыравіны (цукар-сырэц з Бразіліі і Кубы). Асн. прадукцыя (1997): цукар-пясок, патака-мелес, бурачныя жамерыны.

ЖАБІ́НСКАЯ Марыя Пятроўна (н. 22.5.1938, в. Карані Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва, мастацтвазнавец. Скончыла Мінскае маст. вучылішча (1961), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1969). Працавала ў праектна-тэхнал. ін-це «Белмясцпрампраект», Рэсп. доме нар. творчасці, навукова-метадычным цэнтры культуры, цэнтры эстэт. выхавання дзяцей. Аўтар-складальнік альбомаў, каталогаў, метадычных дапаможнікаў і ілюстрацый да іх і ў т.л. да энцыклапедычных выданняў («Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя», на рус. мове, т. 4), у якіх даследуе бел. нар. мастацтва: «Мастацтва сяла Неглюбка» (1976), «Арнамент беларускіх народных тканін» (1983), «Адраджэнне забытага рамяства» (1985), «Свет вачыма дзяцей» (1992) і інш. Адна са стваральнікаў краязнаўчага музея ў в. Моталь Іванаўскага р-на (1984—87).

Тв.: Складзі ўзор сам. Мн., 1992; Выцінанка. Мн., 1996.

ЖА́БІЦКАЯ ШКЛЯНА́Я МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1806—1905 у в. Жабічы Вілейскага пав. (цяпер вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл.). У 1866—90 выпускала бутэлькі, аптэкарскі посуд, слоікі, у 1893—1900 — бутэлькі зялёныя, шкло аконнае паўбелае і лямпавае. У 1891 дзейнічала шклоплавільная печ. Працавала да 116 чал. Прадукцыю збывалі ў Вільню, Мінск, Рыгу, Гродна і інш.

«ЖА́БКА», бел. нар. танец. Муз. памер 2/4. Бытаваў пераважна на Бел. Палессі і Віцебшчыне. Выконваўся мужчынамі. Асн. змест танца — жартоўнае перайманне рухаў і скокаў жаб, часта з выкарыстаннем трукавых рухаў. «Ж.» выконвалася найчасцей сола, адным ці двума мужчынамі: абапіраючыся на падлогу рукамі, сагнутымі ў локцях, і пальцамі выцягнутых ног, адзін з іх падскокамі рухаўся па падлозе, другі, расставіўшы ногі, скакаў над ім. Сярод шматлікіх рухаў «Ж.» — скокі на руках з выцягнутымі ўперад нагамі, скокі адзін цераз аднаго ў гарыз. становішчы, кулянне праз галаву і інш. Часам танец выконвалі жанчыны, зрэдку з прыпеўкамі ці імітацыяй квакання жаб. *Ю.М.Чурко.*

ЖА́БНІК (Hydrocharis), род кветкавых раслін сям. жабнікавых. Вядомы 2 віды, пашыраныя ў Еўразіі. На Беларусі — Ж. звычайны, або жабіны (H. morsus-ranae). Нар. назва парэз. Расце ў азёрах, сажалках, старыцах. Разводзіцца ў акварыумах.

Шматгадовая расліна выш. 15—30 см, з белаватымі каранямі, укрытымі карычневымі валаскамі, свабодна плавае на паверхні вады. Сцябло з доўгімі міжвузеллямі. Лісце круглаватае з выразкай каля асновы, на доўгіх чаранках, у разетцы. Кветкі белыя, з жоўтымі плямамі каля асновы пялёсткаў, на доўгіх кветаносах, несцікавыя адзіночныя, тычынкавыя па 2—4 у суквецці. Цвіце ў чэрв.—ліпені. Плод ягадападобны. Размнажаецца пераважна вегетатыўна. Зімуе ў выглядзе асобных пупышак, якія ўвосень апускаюцца на дно, а вясною ўсплываюць на паверхню вады. Лек. (супрацьзапаленчы, заспакаяльны, вяжучы сродак) расліна.

Жабнік звычайны.

ЖАБРО́ЎСКІ Канстанцін Адамавіч (псеўд. Костка, Навіцкі; 1838, Аўгустоўская губ. — 6.7.1863), удзельнік паўстання 1863—64 у Польшчы, Літве і Беларусі. Скончыў Арлоўскі кадэцкі корпус і Канстанцінаўскае ваен. вучылішча (Пецярбург). З 1861 вучыўся ў Артыл. акадэміі ў Пецярбургу, уваходзіў у ваен. рэв. арг-цыю. 16.4.1863 уцёк на Магілёўшчыну, прызначаны паўстанцкім ваен. начальнікам Сенненскага пав. З групай каля 100 валанцёраў перайшоў у Барысаўскі пав., дзе злучыліся некалькі паўстанцкіх груп. 19.5.1863 аб'яднаны атрад разбіты ўрадавымі войскамі каля в. Падбярэззе. Ж. схоплены і паводле прысуду расстраляны ў Барысаве. *Г.В.Кісялёў.*

ЖАБРО́ЎСКІ Тамаш (25.11.1714, каля г. Навагрудак — 18.3.1758), бел. архітэктар, матэматык. Прадстаўнік стылю барока. Вывучаў філасофію ў Віленскай езуіцкай акадэміі (1735—38), матэматыку, фізіку, астраномію і архітэктуру ў Вене і Празе. Выкладаў у Віленскай езуіцкай акадэміі (1752—58) і Полацкім калегіуме. Асн. пабудовы, езуіцкі касцёл у Бабруйску (1745—46), касцёл св. Ігнацыя і калегіум (1748—50), абсерваторыя езуіцкага калегіума (1752—53), перабудова касцёла св. Яна (1756—58) — усе ў Вільні, інтэр'ер кальвінскага збору ў в. Жодзішкі Смаргонскага р-на (1757—66). Аўтар праекта касцёла бенедыктынак у в. Крож (Літва). Кіраваў буд-вам Полацкага езуіцкага кляштара, праектаваў (каля 1750) палац Агінскага

ў маёнтку Ганута Ашмянскага пав. (цяпер в. Ручыца Вілейскага р-на).

ЖА́БРЫ, гл. *Шчэлепы.*

ЖАБРЫ́ЦА (Seseli), род кветкавых раслін сям. сельдэрэевых. Каля 80 відаў. Пашыраны ў Еўропе і Азіі. На Беларусі 3 віды: Ж. аднагадовая (S. annua), Крылова (S. krylovii) і звілістая (S. tortuosum). Растуць у сухіх светлых лясах, хмызняках, на схілах і ўзлесках, як занесеныя — каля дарог.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны з разгалінаваным прамастойным сцяблом і верацёнападобным патоўшчаным коранем або карэнішчам. Лісце чаргаванае, тонкае, перыстарассечанае, шыза-зялёнае. Кветкі дробныя, белыя, у складаных парасонніках. Плод — віслаплоднік з 2 мерыкарпія-

Жабрыца аднагадовая.

мі. Лек. (мачагонны, гаючы і ветрагонны сродак) і эфіраносныя расліны. *Г.У.Вынаеў.*

ЖАБРЭ́Й, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Зябер.*

ЖА́БЧЫЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР. Утворана 15.1.1940 у Пінскай вобл. Цэнтр — в. Жабчыцы. 12.10.1940 падзелены на 12 сельсаветаў. З 8.1.1954 у Брэсцкай вобл. 30.5.1955 цэнтр раёна перанесены ў в. Малоткавічы. 14.10.1957 Ж.р. скасаваны, 2 сельсаветы перададзены Іванаўскаму, 1 — Лагішынскаму, 6 — Пінскаму р-нам.

ЖА́БЫ с а п р а ў д н ы я (Ranidae), сямейства *бясхвостых земнаводных*. 8 падсям., 46 родаў, 555 відаў. Пашыраны ўсюды, за выключэннем Антарктыды, Паўд. Амерыкі, Паўд. Аўстраліі, Новай Зеландыі. Наземныя і водныя жывёлы. Найб. вядомыя Ж.: *жаба-бык*, жаба-галіяф (Rana goliaph), азёрная (R. ridibunda), вастрамордая (R. arvalis-terrestris), сажалкавая (R. lessonae=esculenta), травяная (R. temporaria) і інш. Ж. леапардавая (R. pipiens) з Паўн. Амерыкі ў Чырв. кнізе МСАП. На Беларусі 4 віды: азёрная і сажалкавая — водныя формы, жывуць у вадзе ці каля яе; вастрамордая і травяная — наземныя формы, жывуць на балотах, заліўных лугах, палянах, у садах, парках, каля жылля.

Даўж. 1,3—33 см (зрэдку да 40 см, маса да 5 кг (жаба-галіяф). Водныя Ж. пераважна зялёныя, наземныя — карычневыя або бурыя. Характэрныя асаблівасці: скура пераважна гладкая, на верхняй сківіцы зубы; самкі большыя за самцоў. Цела звычайна згрубнае, з доўгімі (скакальнымі) заднімі канечнасцямі. Размнажаюцца пераважна ў вадаёмах. У перыяд размнажэння многім Ж. уласціва разнастайная гукавая сігналізацыя (т. зв. «канцэрты»). Лічынкі Ж. — *апалонікі*. Кормяцца ў асноўным насякомымі, вусенямі, мурашкамі, павукамі і інш. беспазваночнымі, маляўкамі рыб, буйныя — птушанятамі дробных птушак, палёўкамі, землярыйкамі і інш. Ж. і іх лічынкамі кормяцца некат. рыбы, птушкі, млекакормячыя. Некат. Ж. зімуюць у вадаёмах, іншыя — на сушы. Класічныя аб'екты лабараторных даследаванняў (як пакутніцам навукі пастаўлены помнікі ў Парыжы і Токіо). Далікатнае мяса задніх лапак многіх Ж. выкарыстоўваюць у дыетычным харчаванні народы Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Еўропы; самыя смачныя — азёрная, сажалкавая, травяная (штучна разводзяць). Скура буйных Ж. ідзе на выраб сувеніраў і ўпрыгожанняў, яд выкарыстоўваецца ў медыцыне.

ЖАБЯНЦЯ́ЕЎ Аляксандр Ільіч (н. 6.8.1944, в. Мядзвёдка Віцебскага р-на), бел. вучоны ў галіне аналітычнай і таксікалагічнай хіміі. Д-р фармацэўтычных навук (1989), праф. (1991). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1966). З 1978 працуе ў ім. Навук. працы па распрацоўцы новых спосабаў кантролю за якасцю лекавых сродкаў.

Тв.: Фотометрия азотсодержащих лекарственных веществ с применением кислотных красителей (разам з А.П.Арзамасцавым) // Фармация. 1993. № 5; Химико-аналитические свойства флуоресцирующих ассоциатов этония с галогенопроизводными флуоресцеина (разам з А.К.Жарнасекам) // Весці АН Беларусі. Сер. хім. навук. 1996. № 2.

ЖА́ВАРАНАК Сяргей Уладзіміравіч (н. 28.6.1953, в. Селішча Ушацкага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне імуналогіі, інфекц. хвароб, эпідэміялогіі і радыяцыйнай медыцыны. Д-р мед. н. (1990), праф. (1992). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1976). Працуе ў ім з 1976, з 1991 дырэктар Віцебскага філіяла н.-д. клінічнага ін-та радыяцыйнай медыцыны і эндакрыналогіі, адначасова з 1997 — Віцебскага філіяла Рэсп. навук.-практычнага цэнтра па лячэнні хранічных вірусных гепатытаў. Навук. працы па эпідэміялогіі, патагенезе, клінічных праявах вірусных гепатытаў, прычынах актывацыі асобных вірусных інфекцый у людзей, што пацярпелі ад уздзеяння розных доз іанізуючай радыяцыі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Апісаў вірусныя дэльта- і С-гепатыты, распрацаваў прэпараты для дыягностыкі інфекц., аўтаімунных, анкалагічных і эндакрынных хвароб на аснове імунаферментнай тэхналогіі, мерапрыемствы па прафілактыцы, ранняй дыягностыцы і лячэнні радыяцыйна-індукаваных хвароб сярод насельніцтва Беларусі, што пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Тв.: Разработка радиоиммунного метода опеределения НВе-антигена (у сааўт.) // Актуальные вопросы патогенеза и терапии инфекционных и паразитарных болезней. Л., 1987; Пособие по иммунологии. Витебск, 1996 (у сааўт.); Клинико-морфологические аспекты скрининга радионуклидов в трупном материале (Витебская и Гомельская области) // (у сааўт.) // Медицинская радиология и радиационная безопасность. 1996. № 1.

ЖА́ВАРАНКАЎ Мікалай Міхайлавіч (7.8.1907, с. Стралецкія Выселкі Разанскай вобл., Расія — 5.8.1990), сав. хімік і тэхнолаг. Акад. АН СССР (1962; чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхнал. ін-т

М.М.Жаваранкаў.

(1930), дзе і працаваў (з 1948 рэктар). У 1962—88 дырэктар Ін-та агульнай і неарган. хіміі і Ін-та новых хім. праблем АН СССР. Навук. працы па агульнай і неарган. хіміі, тэхналогіі неарган. матэрыялаў. Даследаваў гідрадынаміку, маса- і цеплаабмен у працэсах адсорбцыі, рэктыфікацыі, малекулярнай дыстыляцыі. Прапанаваў спосабы аптымізацыі некаторых стадый вытв-сці аміяку і азотнай к-ты, прамысл. метады атрымання ізатопаў азоту ^{15}N і кісларoду ^{18}O высокай канцэнтрацыі, спосабы раздзялення стабільных ізатопаў лёгкіх элементаў. Дзярж. прэмія СССР 1953, 1984.

Літ.: Н.М.Жаворонков. 2 изд. М., 1987.

ЖА́ВАРАНКІ, птушкі сям. жаваранкавых атр. вераб'інападобных. 15 родаў, 78 відаў. Пашыраны пераважна ў Еўразіі, Афрыцы, Паўд. Амерыцы, Аўстраліі. Жывуць на адкрытых прасторах: палях,



Жаваранкі:
1 — лясны;
2 — палявы;
3 — чубаты;
4 — рагаты.

стэпах, горных лугах, радзей лясных палянах і інш. Ж. разуанскі (Calandrella razae) занесены ў Чырв. кнігу МСАП. На Беларусі 4 віды: Ж. лясны (Lullula arborea), Ж. палявы (Alauda arvensis) — звычайныя пералётныя птушкі; Ж. чубаты (Galerida cristata), нар. назвы смяцюх, сметнік — аселы, найб. шматлікі на Пд; Ж. рагаты (Eremophila alpestris) — пралётны.

Даўж. цела 11—25 см, маса 15—70 г. Целасклад моцны. Ногі кароткія, на заднім пальцы шпорападобны кіпцюр. Крылы доўгія. Афарбоўка апярэння зямлістая, валляка і грудзей — часта плямістая. Гнёзды на зямлі, нясуць 2—6 яец (некат. двойчы на год). Самцы многіх відаў у трапяткім палёце пяюць над гнездавой тэрыторыяй. Ж. чубаты можа імітаваць галасы інш. птушак. Кормяцца насякомымі, насеннем раслін.

ЖАВАРЫ́ (Javari), рака ў Паўд. Амерыцы, правы прыток р. Амазонка. Амаль на ўсім працягу з'яўляецца мяжой паміж Бразіліяй і Перу. Даўж. 1056 км, пл. бас. 91 тыс. км^2. Вытокі ў Перуанскіх Андах (Мантанья), цячэ па Амазонскай нізіне ў звілістым рэчышчы. Жыўленне дажджавое. Паводка са снеж. да красавіка. Сярэдні гадавы расход вады 4260 м^3/с. Суднаходная на 500 км для невял. суднаў.

ЖА́ГАТА (Žagata) Улдыс (н. 17.3.1928, г. Еру, Латвія), латышскі артыст балета, балетмайстар. Нар. арт. Латвіі (1973), нар. арт. СССР (1988). Скончыў балетную школу пры Латв. т-ры оперы і балета (1948), у 1944—68 саліст гэтага т-ра. З 1968 маст. кіраўнік Дзярж. ансамбля танца «Дайле». Сярод партый: Нікіта («Лайма» А.Лепіня), Пеця («Юнацтва» М.Чулакі), Бірбанта («Карсар» А.Адана), Гармодый («Спартак» А.Хачатурана). Дзярж. прэмія Латвіі 1982.

ЖАГРАНКО́Ў Іван Міхайлавіч (10.11.1923, в. Паловы Асташкаўскага р-на Цвярской вобл., Расія — 3.7.1944), удзельнік вызвалення Беларусі ад нямфаш. захопнікаў, Герой Сав. Саюза (1945). Камандзір стралк. аддзялення сяржант Ж. у складзе войск 1-га Прыбалтыйскага фронту вызначыўся ў баі за в. Траецкае Ветрынскага р-на Віцебскай вобл.: са звязкай гранат кінуўся пад варожы танк, падарваў яго і загінуў сам.

ЖАДА́ННЯ МЫС, мыс на ПнУ Паўночнага в-ва *Новай Зямлі* (76°57′ паўн. ш., 68°35′ усх. д.). Абрывісты, скалісты ўцёс (выш. каля 30 м), які ўдаецца ў мора ў выглядзе паўвострава. У раёне мыса палярная станцыя (з 1931). Названы ў 1596 В.*Барэнцам*.

ЖАДУ́НЬ, Жадунька, рака ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім р-нах Магілёўскай вобл., правы прыток р. Беседзь (бас. Дняпра). Даўж. 47 км. Пл. вадазбору 488 км^2. Пачынаецца за 2,5 км на ПдУ ад в. Жадунька Клімавіцкага р-на. Цячэ па зах. ч. Аршанска-Магілёўскай раўніны. Асн. прытокі — Крупня і Крупнянка (злева). Даліна невыразная, пойма месцамі забалочаная. Рэчышча каналізаванае на працягу каля 25 км. На рацэ г. Касцюковічы.

ЖАДУ́НЬ, рака ў Бранскай вобл. Расіі і Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл. Беларусі, левы прыток р. Беседзь (бас. Дняпра). Даўж. 23 км, у межах Беларусі 12 км. Пл. вадазбору 148 км^2. Пачынаецца на паўн. ускраіне в. Семірычы Бранскай вобл. На рацэ плаціна і сажалка.

ЖАДУ́НЬ, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Альзініца, за 32 км на ПдЗ ад г. Полацк. Пл. 0,43 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 430 м, найб. глыб. 8,4 м, даўж. берагавой лініі 3,1 км. Пл. вадазбору 20,9 км^2. Схілы катлавіны выш. 5—16 м, пераважна разараныя. Берагі месцамі забалочаныя, пад хмызняком. Дно сапрапелістае, уздоўж берагоў пясчанае. Шыр. паласы прыбярэжнай расліннасці да 100 м. Упадаюць 3 ручаі, у т.л. з воз. Братаўна; на У злучана пратокай з воз. Ухвішча.

ЖАДЭ́ІТ (франц. jadeite ад jade нефрыт), мінерал, які належыць да групы манаклінных *піраксенаў*, сілікат натрыю і алюмінію, NaAl(Si$_2$O$_6$). Крышталізуецца ў манакліннай сінганіі. Звычайна ў выглядзе зярністых ці валакністых агрэгатаў. Колер зялёны, белы ці карычневы. Бляск шкляны. Паўпразрысты, вельмі падобны на *нефрыт*. Цв. 6,5—7. Шчыльн. 3,3—3,5 г/см^3. Трапляецца ў метамарфічных горных пародах; утварае скопішчы ў серпенцінітах. Найб. радовішчы ў Бірме. Каштоўны выразны камень.

Жадэіт.

ЖАКА́РДА МАШЫ́НА, механізм *ткацкага станка*, які ўтварае прамежкі (зевы) паміж ніткамі асновы і дазваляе вырабляць тканіну з буйнаўзорыстым (жакардавым) перапляценнем нітак. Створана ў 1804—08 франц. ткачом і вынаходнікам Ж.М.Жакарам.

Складаецца з прыстасавання пад'ёму і апускання нітак і прыстасавання, што стварае ўзор. У адрозненне ад рэмізных зеваўтваральных механізмаў, якія кіруюць вял. групай нітак асновы, Ж.м. кіруе асобна кожнай ніткай асновы ці невялікай іх групай. Гэта дае магчымасць вырабляць тканіны такіх перапляценняў, паўторны элемент якіх мае мноства нітак па аснове і па ўтку. З дапамогай Ж.м. вырабляюць дэкар. тканіны, дываны з выразнымі маляўнічымі, часам вельмі складанымі малюнкамі (пейзажы, партрэты і г.д.).



Жакарда машына: 1 — грузік; 2 — вочка; 3 — дзялільная дошка; 4 — шнур; 5 — кручок; 6 — іголка; 7 — прызма; 8 — падымальны нож.

ЖА́КАЎ Алег Пятровіч (1.4.1905, г. Сарапул, Удмурція — 4.5.1988), рускі акцёр. Нар. арт. СССР (1969). Скончыў Ленінградскі тэхнікум сцэн. мастацтва (1929). З 1925 здымаўся ў кіно. Яго выканальніцкай манеры характэрны знешняя стрыманасць, глыбокі псіхалагізм. Сярод фільмаў: «Сямёра смелых», «Мы з Кранштата», «Нашэсце» (Дзярж. прэмія СССР 1946), «Ля возера» (Дзярж. прэмія СССР 1971), «Фронт без флангаў» і «Фронт за лініяй фронту» (Дзярж. прэмія Расіі 1979), «Гарачае лета ў Кабуле», «Дзяўчына і Гранд».

ЖА́КАЎ Міхаіл Сцяпанавіч (н. 13.10.1928, с. Стары Кувак Ленінагорскага р-на, Татарстан), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1968), праф. (1969). Засл. дз. нав. Беларусі (1974). Скончыў Казанскі вет. ін-т (1951). З 1954 у Віцебскай акадэміі вет. медыцыны, у 1968—95 рэктар. Навук. працы па імунамарфалогіі і імунапаталогіі пры інфекцыйных, інвазійных і асацыятыўных хваробах, вакцынацыях і імунастымуляцыі с.-г. жывёл.

Тв.: Анализ патологоанатомического вскрытия животных. Мн., 1977; Патологическая анатомия с.-х. животных. М., 1995 (у сааўт.); Иммунология и иммунопатология. Витебск, 1996.

ЖАК-ДАЛЬКРО́З (Jaques-Dalcroze) Эміль (Жак; 6.7.1865, Вена — 1.7.1950), швейцарскі педагог, кампазітар. Вучыўся ва ун-це і адначасова ў кансерваторыі ў Жэневе, потым у А.*Брукнера*, Л.*Дэліба* і інш. У 1892—1910 праф. Жэнеўскай кансерваторыі. Распрацаваў сістэму муз.-рытмічнага выхавання, заснаваную на ўвасабленні вобразнага зместу музыкі ў пластычным руху. У 1910 арганізаваў Школу музыкі і рытму ў г. Гелераў (каля Дрэздэна), у 1915 —

Ін-т Ж.-Д. ў Жэневе. Падобныя ін-ты і школы былі засн. яго паслядоўнікамі (М.Вігман, В.*Ніжынскі*, Р.Сен-Дэні і інш.) у многіх гарадах Еўропы і Амерыкі (у 1920 у Маскве і Петраградзе). Аўтар 7 камічных опер і аперэт, кантат («Свята ў кантоне Во», 1903 і інш.), арк. твораў, канцэртаў для інструментаў з арк., песень («Раманскія песні» сталі народнымі), а таксама літ. твораў, прысвечаных яго сістэме выхавання.

ЖАКЕ́Й (англ. jockey), прафесіянальны яздок на конных скачках, спецыяліст па трэнінгу і выпрабаванні коней-скакуноў.

ЖАКЕРЫ́Я (Jacquerie), антыфеадальнае сял. паўстанне ў Францыі ў маі—чэрв. 1358. Выклікана масавым разарэннем сялян у час *Стогадовай вайны 1337—1453*. Непасрэднай прычынай паўстання было ўвядзенне вясной 1358 дадатковай паншчыны для аднаўлення разбураных вайной замкаў і крэпасцей. Пачалося 28 мая ў мяст. Сен-Лё-д' Эсеран (вобл. Бавезі) і хутка ахапіла Пн Францыі (удзельнічала 100 тыс. чал.). Адным з яго кіраўнікоў быў Гільём Каль, які спрабаваў дысцыплінаваць сял. войска і заручыцца падтрымкай гарадоў, асабліва Парыжа. Паўстаўшыя сяляне (жакі) знішчалі, рабавалі маёмасць дваран, разбуралі іх замкі, маёнткі. Супраць іх выступіў кароль Навары Карл Злы на чале 1 тыс. чал. 10 чэрв. каля Клермона войска жакаў (каля 6600 чал.) было разгромлена. Запрошаны перад бітвай Карлам Злым на перагаворы Каль быў схоплены і пакараны смерцю ў Клермоне. Паводле афіц. хронікі, да 24 чэрв. знішчана каля 20 тыс. сялян. 10.8.1358 абвешчана агульная амністыя.

Літ.: Семенов В.Ф. Жакерия. Л., 1958; Басовская Н.И. Капитан жаков // И живы памятью столетий. Мн., 1987.

Дз.М.Чаркасаў.

ЖАКО́, шэры папугай (Psittacus erithacus), птушка атр. папугаепадобных. 3 падвіды. Пашыраны ў лясах экватарыяльнай Афрыкі ад Сьера-Леоне да З Кеніі, на а-вах Сан-Таме і Прынсіпі. Трымаюцца вял. чародамі, зрэдку асобнымі парамі.

Даўж. 35—40 см. Апярэнне шэрае, хвост — ярка-чырвоны, кароткі. Дзюба чорная, вузкая. Гняздуецца ў дуплах высокіх дрэў, нясе 2 яйцы. Корміцца пладамі і насеннем. Здольны да гукапераймання. Утрымліваецца ў няволі, дзе размнажаецца рэдка.

Жако.

ЖАКО́Б (Jacob), сям'я франц. майстроў маст. мэблі.

Жорж (6.7.1739, Шэні, Францыя — 5.7.1814). Стварыў свой стыль мэблі ў стылі класіцызму (разная з пазалотай, пазней з паліраванага чырв. дрэва і пазалочанай бронзы з ант. матывамі). Працаваў таксама па эскізах Ж.Л.*Давіда* (мэбля для майстэрні жывапісца, 1789—90), Ш.Персье і П.Фантэна (мэбля для залы пасяджэнняў Канвента ў парыжскім палацы Цюільры, 1793) і інш.

Франсуа Анарэ (празваны Жакоб Дэмальтэр; 6.2.1770, Парыж — 15.8.1841). Сын Жоржа. Пасля 1803 заснаваў разам з бацькам фірму (існавала да 1812), якая праславілася сваёй мэбляй у стылі ампір для палацаў Напалеона I, Цюільры.

Жорж Альфонс (21.2.1799, Парыж — 7.6.1870). Сын Франсуа Анарэ. З сярэдзіны 19 ст. вырабы яго майстэрні вызначаліся як «стыль жакоб» (мэбля з чырв. дрэва з наклеенымі палоскамі латуні).

Да арт. **Жакоб.** Ф.А. Жакоб. Туалет з палаца Цюільры. 1805—10.

ЖАКО́Б (Jacob) Макс (11.7.1876, г. Кемпер, Францыя — 5.3.1944), французскі пісьменнік і мастак. Дэбютаваў казкамі «Кароль Кабул і кухцік Гавен» (1903), «Сонечны волат» (1904) і гратэскнымі раманамі «Святы Матарэль» (1909), «Бурлескныя і містычныя творы брата Матарэля» (1912). Зб-кі вершаў у прозе «Ражок з ігральнымі касцямі» (1917), кн. вершаў «Цэнтральная лабараторыя» (1921) і кніга крыт. артыкулаў «Паэтычнае мастацтва» (1922) адыгралі значную ролю ў станаўленні авангардызму, у прыватнасці кубізму. У зборніках «Бераг. Брэтонскія песні» (1911), «Тыя, што каюцца, у ружовых трыко» (1925), «Імператарская ахвяра» (1929), «Балады» (1938), «Цар Беотыі» (1920) і інш. спалучаюцца пародыя, містыфікацыя, гратэск з містыкай, сінтэз антычнай, хрысц. і іудзейскай міфалогій. Шэраг яго твораў выдадзены псеўданімічна, у т.л. «Апошнія вершы» (1945). Загінуў у фаш. канцлагеры.

Тв.: Рус. пер. — Избр. стихи. СПб., 1995.

К.М.Міхееў.

ЖАКО́Б (Jacob) Франсуа (н. 17.6.1920, г. Нансі, Францыя), французскі мікрабіёлаг, генетык. Чл. Парыжскай АН (1977). Замежны чл. Лонданскага кара-

Ф.Жакоб.

леўскага навук. т-ва (1973), Амер. акадэміі навук і мастацтваў (1964). Скончыў Парыжскі ун-т (1947). Да 1950 працаваў у ім, з 1950 у Ін-це Пастэра ў Парыжы (з 1960 праф.), адначасова з 1965 у *Калеж дэ Франс*. Навук. працы па генетыцы бактэрыяльных клетак і вірусаў. Адзін з аўтараў гіпотэзы пераносу генетычнай інфармацыі і рэгуляцыі сінтэзу бялку ў бактэрыяльных клетках (канцэпцыя аперона). Аўтар прац па лізагеніі (канцэпцыя эпісом). Нобелеўская прэмія 1965 (разам з А.*Львовым* і Ж.*Мано*).

ЖАКО́ЎСКІ Рамуальд (1897—1.1.1919), бел. акцёр. У 1917—19 у трупе *Першага таварыства беларускай драмы і камедыі*. Выканаўца характарных роляў (Пісар і Кукса — «Пашыліся ў дурні» М.Крапіўніцкага, сват Якуб — «Модны шляхцюк» К.Каганца і інш.). Стварыў глыбока псіхал. вобраз Старца ў «Раскіданым гняздзе» Я.Купалы. Выступаў з чытаннем вершаў бел. паэтаў (часам і сваіх) у дывертысментах.

ЖАЛАБАБРУ́ХІЯ, гл. *Баразнаватабрухія.*

ЖАЛАБО́ЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч (н. 8.5.1946, в. Скілоравічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. спартсмен (лёгкая атлетыка, бег). Майстар спорту міжнар. класа (1970). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1969). Чэмпіён Еўропы ў закрытым памяшканні ў эстафеце 3 × 1000 м (1969). Неаднаразовы чэмпіён СССР у бегу на 1500 м, 5000 м і ў кросе на дыстанцыі 8 км. Пераможца і прызёр міжнар. спаборніцтваў.

ЖАЛАКЯ́ВІЧУС (Žalakevičius) Вітаўтас (14.4.1930, г. Каўнас, Літва —

12.11.1996), літоўскі кінарэжысёр. Нар. арт. Літвы (1981), нар. арт. Расіі (1980). Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1956). Працаваў на Літоўскай кінастудыі (1956—74, з 1980 маст. кіраўнік), на «Масфільме» (1974—80). Яго фільмы адметныя рэалістычным адлюстраваннем рэчаіснасці, напружанымі маральнымі канфліктамі, дынамічным развіццём сюжэта, метафарычнасцю кінамовы: «Адам жадае быць чалавекам» (1959), навела «Жывыя героі» ў аднайм. фільме (1960, Дзярж. прэмія Літвы), «Ніхто не хацеў паміраць» (1965, прэмія Ленінскага камсамола 1966, Дзярж. прэмія СССР 1967), «Гэта салодкае слова — свабода» (1973), «Кентаўры» (1979), «Звер, які выходзіць з мора» (1992) і інш.

ЖАЛДАКО́Ў Анатоль Уладзіміравіч (н. 18.5.1929, г. Уладзікаўказ, Паўночная Асецыя), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1991). Скончыў Маскоўскі арх. ін-т (1954). Працаваў у ін-це «Валгаградгрmaмадзянпраект». З 1970 у ін-це «Белдзіпрагандаль», з 1990 кіраўнік творчай майстэрні Саюза архітэктараў Беларусі. Асн. работы на Беларусі: Мінскі крыты рынак «Камароўскі» (1980, у сааўт.), універсамы «Рыга» (1980) і «Талін» (1982), службова-гасп. корпус СМ Беларусі (1981), будынкі Мін-ва гандлю і Мін-ва спорту і турызму (1980), праект комплексу магазінаў па вул. Няміга (1981) — усе ў Мінску; крыты рынак у Брэсце (1987). Аўтар шэрагу грамадскіх будынкаў у Валгаградзе і Бранску.

ЖАЛЕ́ЗА (лац. Ferrum), Fe, хімічны элемент VIII групы перыяд. сістэмы, ат. н. 26, ат. м. 55,847. Складаецца з 4 стабільных ізатопаў: ^{54}Fe (5,84%), ^{56}Fe (91,68%), ^{57}Fe (2,17%), ^{58}Fe (0,31%). У зямной кары 4,65% па масе (найб. распаўсюджаны метал — другі пасля алюмінію). Вядома больш за 300 мінералаў (гл. *Жалезныя руды*). Самародное (метэорнае і тэлурычнае) сустракаецца рэдка. Прысутнічае ў арганізмах усіх жывёл і раслін, уваходзіць у склад гемаглабіну.

Ж. — бліскучы серабрыста-белы пластычны метал, $t_{пл}$ 1535 °С, $t_{кіп}$ 2750 °С, шчыльн. 7870 кг/м³ (20 °С). Пры звычайным ціску адрозніваюць некалькі крышт. мадыфікацый: α-Fe (існуе да 917 °С), δ-Fe (пры т-рах вышэй за 1394 °С і да т-ры плаўлення) з аб'ёмнацэнтраванай кубічнай рашоткай і γ-Fe (у інтэрвале 917 — 1394 °С) з гранецэнтраванай кубічнай рашоткай. Пры т-ры 769 °С (пункт Кюры) ферамагн. α-Fe пераходзіць у парамагн. стан. Парамагн. Ж., устойлівае ў інтэрвале 769—917 °С, наз. β-Fe. Ж. не растваральны ў вадзе і шчолачах. У вільготным паветры акісляецца і пакрываецца ржой (гл. *Карозія металаў*), у сухім (пры награванні вышэй за 200 °С) — ахоўнай плёнкай аксідаў (гл. *Вараненне*). З разбаўленымі к-тамі ўтварае солі Fe(II) (гл. *Жалеза злучэнні*), канцэнтраванымі азотнай і сернай — пасіўруецца. Пры награванні ўзаемадзейнічае з галагенамі, серай, фосфарам, вугляродам, аксідам вугляроду (гл. *Карбанілы металаў*), вадзяной парай. Асн. масу Ж. выплаўляюць у выглядзе *чыгуну* і *сталі*. Аднаўленнем *жалеза аксідаў* пры 750—1200 °С атрымліваюць губчатае Ж. (97—99% Fe), раскладаннем пентакарбанілу $Fe(CO)_5$ — карбанільнае (парашок з памерамі часцінак 1—15 мкм). Выкарыстоўваюць як матэрыял для стрыжняў электрамагнітаў і якараў эл. машын (тэхнічна чыстае), як каталізатар, антыанемічны сродак (карбанільнае) і інш.

Літ.: Беккерт М. Железо: Факты и легенды: Пер. с нем. 2 изд. М., 1988.

І.В.Боднар.

ЖАЛЕ́ЗА АКСІ́ДЫ, злучэнні жалеза з кіслародам. Вядомы аксіды жалеза (II) FeO, (III) Fe_2O_3 і змешаны (II, III) Fe_3O_4 ці $FeO{\cdot}Fe_2O_3$. У прыродзе сустракаюцца ў выглядзе мінералаў *гематыту*, *магнетыту* і вельмі рэдкага іацыту (FeO). Крышт. рэчывы. Не растваральны ў вадзе, растваральны ў к-тах. Fe_2O_3 атрымліваюць акісленнем жалеза пры награванні ці абпалам пірыту FeS_2; інш. — аднаўленнем Fe_2O_3 у асяродзі аксіду вугляроду ці вадароду. Выкарыстоўваюць як сыравіну для атрымання жалеза, як мінер. пігменты, кампаненты фарытаў, абліцовачнай керамікі і інш.

ЖАЛЕ́ЗА ЗЛУЧЭ́ННІ, хімічныя злучэнні, у састаў якіх уваходзіць *жалеза*, пераважна ў ступені акіслення +2 і +3. Найб. пашыраны неарган. Ж.з. — *жалеза аксіды*, гідраксіды, карбіды (гл. *Жалезавугляродзістыя сплавы*), сульфіды, сульфаты, карбанілы (гл. *Карбанілы металаў*), цыяністыя комплексныя солі (гексацыянаферат, гл. *Калію злучэнні*), а таксама жалезаарган. злучэнні (гл. *Ферацэн*).

Жалеза (II) гідраксід $Fe(OH)_2$ — бледна-зялёнае аморфнае ці крышт. рэчыва. Узаемадзейнічае з к-тамі, акісляецца на паветры да гідраксіду Fe (III). Жалеза (III) гідраксід $Fe_2O_3{\cdot}nH_2O$ — бурае аморфнае рэчыва, не растваральнае ў вадзе, растваральнае ў к-тах. У прыродзе — *буры жалязняк*. Асаджэннем шчолачу з растворaў солей Fe (III) атрымліваюць $Fe(OH)_3$ — слабая аснова, амфатэрны (пры сплаўленні са шчолачамі ўтварае *ферыты*). Выкарыстоўваюць як кампанент жоўтага пігменту для фарбаў і эмалей. Жалеза сульфаты, солі сернай к-ты — крышт., гіграскапічныя рэчывы, растваральныя ў вадзе. Утвараюць *крышталегідраты*: гептагідрат $FeSO_4{\cdot}7H_2O$ — жалезны купарвас (мінерал мелантэрыт), блакітнавата-зялёныя крышталі, $t_{пл}$ 64°С. З сульфатамі шчолачных металаў і амонію ўтвараюць двайныя сульфаты: $FeSO_4{\cdot}(NH_4)_2SO_4{\cdot}6H_2O$ (соль Мора) — сіне-зялёныя крышталі, устойлівыя на паветры; $NH_4Fe(SO_4)_2{\cdot}12H_2O$ (жалеза-амоніевы *галун*). Выкарыстоўваюць як кампанент электраліту ў гальванатэхніцы; $FeSO_4$ — кансервант драўніны, фунгіцыд, антыанемічны сродак і інш.; $Fe_2(SO_4)_3$ — растваральнік у гідраметалургіі медзі, каагулянт пры ачыстцы вады, пратрава пры фарбаванні. Жалеза сульфіды — злучэнні жалеза з серай. Монасульфід жалеза FeS, рудыя ці чорныя крышталі, $t_{пл}$ 1193 °С. Не растваральнае ў вадзе, раскладаецца к-тамі. У прыродзе — мінералы піратын (гл. *Калчаданы*) і траіліт. Выкарыстоўваюць для атрымання серавадароду. Дысульфід FeS_2, залаціста-жоўтыя крышталі, мінералы *пірыт* і *марказіт*. Выкарыстоўваюць прыродны як сыравіну для атрымання серы, сернай к-ты, сульфату $Fe_2(SO_4)_3$, сінт. — каталізатар у арган. сінтэзе. Жалеза хларыды — злучэнні жалеза з хлорам, солі салянай к-ты — крышт., гіграскапічныя рэчывы, растваральныя ў вадзе, этаноле, ацэтоне. Дыхларыд жалеза $FeCl_2$ утвараецца пры ўзаемадзеянні жалеза з салянай к-той. Выкарыстоўваюць для атрымання трыхларыду. Трыхларыд $FeCl_3$, цёмна-рудыя крышталі, $t_{пл}$ 309 °С. Выкарыстоўваюць як каагулянт пры ачыстцы вады, кампанент растворaў для электрахіміі, траўлення пячатных плат і інш.

І.В.Боднар.

ЖАЛЕ́ЗА САМАРО́ДНАЕ, мінерал класа самародных элементаў, Fe. Адрозніваюць Ж.с. зямное (тэлурычнае) і касмагеннае (метэарытнае), што трапляе на Зямлю ў выглядзе *метэарытаў*. Тэлурычнае, або ферыт, мае нікелю да 3%, аваруіт, або нікель-жалеза, — ад 30 да 80%, метэарытнае — камасіт — каля 6,4%. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Крышталі рэдкія, звычайна дэндрыты, зерні, суцэльныя масы. Колер і бляск як у метал. жалеза. Цв. 4—5. Шчыльн. 7—7,8 г/см³. Коўкае. Ферамагнетык. Рэдкі мінерал, звязаны ў асноўным з базальтамі, утвараецца таксама ў сідэрытавых намнажэннях, каменных вуглях і ў балотных жал. рудах.

ЖАЛЕ́ЗА СПЛА́ВЫ, металічныя сістэмы, адным з кампанентаў якіх (як правіла, пераважным) з'яўляецца *жалеза*. Найб. часта выкарыстоўваюць сплавы жалеза з вугляродам (*сталь*, *чыгун*). Да Ж.с. адносяць сплавы са спец. ўласцівасцямі (высокім эл. супраціўленнем, малым цеплавым расшырэннем, магнітнымі і інш.), а таксама *ферасплавы*.

Жалеза самароднае ў габра-далерыце.

ЖАЛЕЗАБАКТЭ́РЫІ, мікраарганізмы, здольныя акісляць закісныя злучэнні жалеза ў вокісныя. Адрозніваюць тыповыя *аўтатрофы* (выкарыстоўваюць вызваленую энергію на засваенне вугляроду з вуглякіслага газу ў працэсе *хемасінтэзу*) і *гетэратрофы*, у якіх акісленне жалеза з'яўляецца пабочнай рэакцыяй. Аўтатрофы акісляюць таксама серу і маюць першараднае значэнне ў фарміраванні зоны сернакіслага выветрывання сульфідных руд. Некаторыя гетэратрофныя Ж. спрыяюць утварэнню балотных руд, забруджваюць вадасцёкі, парушаюць водазабеспячэнне. Ж. засяляюць вадаёмы, маюць вял. значэнне ў кругавароце жалеза ў прыродзе. На дне вадаёмаў адкладаюць вокіслы марганцу.

ЖАЛЕЗАБЕТО́Н, штучны будаўнічы матэрыял з *бетону* і стальной *арматуры*, якія маналітна злучаны і працуюць у канструкцыі як адно цэлае. Сумесная

работа бетону і арматуры забяспечваецца іх трывалым счапленнем, амаль аднолькавымі каэф. лінейнага расшырэння. Бетон успрымае ў асн. сціскальныя намаганні, надае канструкцыі жорсткасць, ахоўвае арматуру ад карозіі; арматура (падоўжаныя стрыжні, папярочныя хамуты, мантажная для каркасаў) успрымае расцягвальныя намаганні. Вызначаецца высокай трываласцю, даўгавечнасцю, вогнеўстойлівасцю, прастатой формаўтварэння. Выкарыстоўваецца ў жыллёвым і прамысл. буд-ве, мостабудаванні, гідратэхн. буд-ве і інш. З Ж. робяць разнастайныя *жалезабетонныя вырабы і канструкцыі*.

Ж. бывае звычайны і папярэдне напружаны (яго арматуру перад бетанаваннем штучна нацягваюць, што абціскае бетон, павялічвае яго трываласць і трэшчынаўстойлівасць; гл. *Папярэдне напружаныя канструкцыі*), саманапружаны (робіцца з выкарыстаннем т.зв. напружвальнага цэменту, які пры цвярдзенні расшыраецца), зборны, маналітны і інш. Патэнт на Ж. атрымаў франц. вучоны Ж.Манье ў 1867. Канструкцыі з Ж. хутка пашырыліся ў Англіі, ЗША, Расіі (з 1885) і інш. краінах. У 1901—02 на чыг. лініі Віцебск—Жлобін было пабудавана 27 жалезабетонных мастоў і пуцеправодаў. Ж. стаў адным з найб. пашыраных матэрыялаў у буд-ве, які выкарыстоўваецца ў розных канструкцыях будынкаў і збудаванняў (фундаментаў, пліт, сцен, труб, мастоў, плацін і г.д.), ва ўсіх кліматычных зонах (фіз.-мех. ўласцівасці Ж. пры т-рах ад -40 да + 60 °С практычна не змяняюцца). Значны ўклад у развіццё навукі пра Ж. зрабілі рас. і сав. вучоныя М.А.Белялюбскі, А.Ф.Лалейт, Р.П.Перадзерый, В.В.Міхайлаў, А.А.Гвоздзеў, бел. вучоныя І.М.Ахвердаў, Я.І.Дрозд і інш.

Літ.: Гл. пры арт. *Жалезабетонныя вырабы і канструкцыі.*

П.М.Багаслаўчык.

ЖАЛЕЗАБЕТО́ННЫЯ ВЫ́РАБЫ І КАНСТРУ́КЦЫІ, элементы будынкаў і збудаванняў, вырабленыя з *жалезабетону*. Бываюць: маналітныя (фармуюцца ў апалубцы на месцы буд-ва), зборныя (састаўляюцца з асобных элементаў, папярэдне зробленых на спец. з-дах і палігонах) і зборна-маналітныя (спалучаюць зборныя элементы з маналітным бетонам, які ўкладваецца на буд. пляцоўцы); звычайныя (іх разнавіднасць — *армацэментавыя канструкцыі) і папярэдне напружаныя канструкцыі*; з стальной, шклапластыкавай *арматурай* і дысперснаарміраваныя (з фібрабетону); вібраўшчыльненыя, цэнтрыфугаваныя, прасаваныя, вакуумаваныя, атрыманыя камбінаванымі спосабамі і інш.

Маналітныя канструкцыі выкарыстоўваюцца пераважна пры асабліва вял. нагрузках (фундаменты, каркасы і перакрыцці шматпавярховых прамысл. будынкаў, гідратэхн. аб'екты, пакрыцці аўтадарог, элементы мастоў, пуцеправодаў і інш.). *Зборныя канструкцыі* пашыраны пры індустр. буд-ве. Ідуць на фундаменты і падземныя часткі будынкаў і збудаванняў (фундаментальныя блокі і пліты, панэлі і блокі сцен падвалаў), на каркасы будынкаў (калоны, рыгелі, прагоны, падкранавыя бэлькі, фермы), на вонкавыя і ўнутр. сцены (сценавыя і перагародачныя панэлі і блокі), на міжпавярховыя перакрыцці і пакрыцці будынкаў (панэлі, пліты, насцілы) і інш. *Зборна-маналітныя канструкцыі* выкарыстоўваюцца гал. чынам у перакрыццях шматпавярховых будынкаў, у мастах і пуцеправодах, пры ўзвядзенні некаторых абалонак і інш. Іх ужыванне асабліва мэтазгодна пры вял. дынамічных нагрузках (у т.л. сейсмічных), а таксама з-за ўмоў транспартавання і мантажу. У канструкцыях выкарыстоўваецца ў асн. гнуткая арматура ў выглядзе асобных стрыжняў, зварных сетак і каркасаў. Акрамя падоўжнай арматуры ўстанаўліваецца размеркавальная мантажная і папярочная арматура (хамуты, адгіны), часам прадугледжваецца ўскоснае арміраванне ў выглядзе зварных сетак і спіралей. Для папярэдне напружаных канструкцый выкарыстоўваюць высокатрывалую стрыжнёвую арматуру і дрот, а таксама пасмы і канаты з яго; для электраізалюючых, каразійнаўстойлівых і інш. канструкцый спец. прызначэння — шклапластыкавую арматуру (стрыжні з шкляных нітак, аб'яднаных палімернымі кампазіцыямі).

Літ.: Баженов Ю.М., Комар А.Г. Технология бетонных и железобетонных изделий. М., 1984; Ахвердов И.Н. Технология железобетонных изделий и конструкций специального назначения. Мн., 1993; Проектирование железобетонных конструкций:, Справ. пособие. 2 изд. Киев, 1990.

М.М.Гурбо.

ЖАЛЕЗАБЕТО́ННЫЯ РАБО́ТЫ, комплекс работ па ўзвядзенні збудаванняў і канструкцый з маналітнага *жалезабетону*. Уключаюць апалубачныя (гл. ў арт. *Апалубка*), *арматурныя работы* і *бетонныя работы*. Выконваюцца ў паслядоўнасці: выраб і мантаж арматурных каркасаў, сетак і асобных стрыжняў; установка апалубкі; прыгатаванне, транспартаванне, укладка і ўшчыльненне бетоннай сумесі; догляд бетону ў перыяд яго цвярдзення; распалубка пасля дасягнення бетонам неабходнай трываласці. Змацірованыя арматурныя каркасы могуць выкарыстоўвацца пры ўстаноўцы апалубкі для яе фіксацыі ў патрэбным становішчы, а таксама для мацавання закладных дэталей.

П.М.Багаслаўчык.



Жалезабетонныя вырабы і канструкцыі: *а* — жалезабетонны блок (1 — бетон, 2 — арматура са стальных стрыжняў); *б* — папярэдненапружаны блок (1 — стрыжні пад нацяжэннем, 2 — стальныя трубкі); *в* — бэлька з вязаным арматурным каркасам (1 — асноўная рабочая арматура, 2 — хамуты, 3 — мантажная арматура); *г* — калона з вязаным арматурным каркасам (1, 2 — асноўная і папярочная арматура).

ЖАЛЕЗАВУГЛЯРО́ДЗІСТЫЯ СПЛА́ВЫ, сплавы жалеза з вугляродам на аснове *жалеза*. Найб. пашыраныя тэхн. Ж.с. *сталь* (мае да 2% вугляроду С па масе) і *чыгун* (2—4,6% С).

У Ж.с. вуглярод утварае цвёрдыя растворы ўкаранення на аснове паліморфных мадыфікацый жалеза (аўстэніт — раствор С у γ-Fe, мае да 2,03% С, метал. аснова Ж.с. пры т-рах вышэй за 727 °С; ферыт—раствор С у α-Fe, мае да 0,025% С, аснова сплаваў пры t<727 °С), цэментыт (карбід жалеза Fe_3C) ці прысутнічае ў свабодным стане ў выглядзе *графіту*. Графіт маюць Ж.с., якія атрымліваюць пры павольным раўнаважным ахаладжэнні расплаву Fe—C (шэры ці коўкі чыгун). Метастабільны Fe_3C утвараецца пры хуткім ахаладжэнні расплаву, мае высокую цвёрдасць, крохкі. Мех. ўласцівасці Ж.с., пераважна сталі, паляпшаюць пры тэрмічнай апрацоўцы сплаваў пасля зацвярдзення: пры *водпуску* аўстэніт паступова раскладаецца на цэментыт і ферыт (сталь набывае высокую пластычнасць), пры *загартоўцы* ператвараецца ў мартэнсіт (павышаюцца цвёрдасць і зносаўстойлівасць).

Літ.: Гуляев А.П. Металловедение. 6 изд. М., 1986.

Г.Г.Паніч.

ЖАЛЕЗАГРАФІ́Т, сітаваты металакерамічны антыфрыкцыйны матэрыял. Мае 95—98% жалеза і 2—5% графіту, сітавіны запоўнены маслам. Атрымліваюць



Жалезабетонныя вырабы і канструкцыі: *а* — жалезабетонны каркас прамысловага будынка (1 — фундамент; 2, 8 — калоны вонкавая і ўнутраная; 3 — фундаментная бэлька; 4 — сценавая пліта; 5 — падкранавая бэлька; 6 — пліта пакрыцця; 7 — бэлька пакрыцця); *б* — зборныя канструкцыі буйнапанэльнага жылога будынка (1 — фундаментны блок, 2 — пліта перакрыцця, 3 — нясучая панэль папярочнай сцяны, 4 — дахавая пліта, 5 — вонкавая сценавая панэль).

метадам парашковай металургіі. Выкарыстоўваюць для вырабу падшыпнікаў і ўтулак.

ЖАЛЕЗАСЕРАПРАТЭ́ІДЫ, жалеза-серныя бялкі, Fe—S-бялкі, клас бялкоў, прастэтычныя групы якіх складаюцца з негімінавага жалеза, комплексна звязанага з неарган. або арган. (у складзе цыстэіну) серай з утварэннем аднаго ці некалькіх Fe—S-кластэраў. Кластэры здольныя аддаваць ці прымаць электроны (але не вадарод) з абарачальнай зменай валентнасці атамаў жалеза ($Fe^{3+} \rightleftarrows Fe^{2+}$). Дзякуючы гэтаму Ж. ў жывых арганізмах выконваюць функцыю акісляльна-аднаўленчых кампанентаў у тэрмінальных ланцугах пераносу электронаў паміж флавапратэідамі і цытахромамі (гл. *Дыханне*). Малекулярная маса Ж. ад 6000 (ферыдаксіны бактэрый) да 12 000 (ферыдаксіны хларапластаў) і больш (ксантынаксідаза).

ЖАЛЕ́ЗІСТЫЯ КВАРЦЫ́ТЫ, джэспіліты, таканіты, ітабірыты, палоскавыя горныя пароды асадкавага ці вулканагенна-асадкавага паходжання, якія складаюцца ў асноўным з кварцу, магнетыту, радзей гематыту. Маюць характэрную тонкаслаістую будову (таўшч. 0,5—3 мм і больш). Колер цёмнашэры ці фіялетава-чырвоны. Шчыльн. 3240—4290 кг/м^3. Трываласць на сціскванне 370—400 МПа. Жалезная руда (жалеза ў магнетытавых Ж.к. больш за 25—30%, у гематытавых — 50—60%). Радовішчы прымеркаваны да дакембрыйскіх шчытоў і платформ. З Ж.к. складзены буйнейшыя ў свеце пластавыя жалезарудныя радовішчы — Курская магнітная анамалія (Расія), Крыварожскі жалезарудны басейн (Украіна), Мінас-Жэрайс (Бразілія) і інш. На Беларусі вядома *Аколаўскае радовішча жалезных руд* і Рубяжэвіцкае рудапраяўленне Ж.к., якія ўтварыліся асадкавым шляхам у абласцях рухомага вулканізму. *У.Я.Бардон.*

ЖАЛЕЗНАВО́ДСК, горад у Расіі, у Стаўрапольскім краі, на паўд. схілах г. Жалезная, на выш. 600—630 м, за 5 км ад чыг. ст. Бештау. Засн. ў 1842, горад з 1917. 29,4 тыс. ж. (1992). Пяцігорскі НДІ курарталогіі і фізіятэрапіі. Арх. помнікі: Астроўскія ванны (канец 19 ст.), дача бухарскага эміра і Пушкінская галерэя (пач. 20 ст.). Бальнеалагічны і гразевы курорт. Уваходзіць у групу курортаў *Каўказскія Мінеральныя Воды*. Клімат умерана кантынентальны з мяккай зімой, цёплым летам. Аснова курортных рэсурсаў — мінер. воды, радовішчы якіх эксплуатуюцца з 19 ст. (больш за 20 крыніц рознай ступені тэрмальнасці, у т.л. радонавыя), сульфідныя глеевыя гразі Тамбуканскага воз. Лечаць хваробы страўніка, кішэчніка, падстраўнікавай залозы, печані, жоўцевых шляхоў, нырак, мочавыводнай сістэмы. Працуе каля 20 санаторыяў. Ва ўсх. ч. курортнай зоны парк (1825), ніжнія і верхнія тэрасы якога звязаны каскаднай лесвіцай, упрыгожанай фантанамі і вадаёмамі (1932—37).

ЖАЛЕЗНАГО́РСК, горад у Расіі, цэнтр раёна ў Курскай вобл. 90,4 тыс. ж. (1992). Чыг. ст. Аўтадарога Тросна—Кіеў. Прадпрыемствы горна-абагачальнай (жал. руда) і будматэрыялаў прам-сці. Узнік у 1957 як пасёлак у сувязі з асваеннем Міхайлаўскага радовішча жал. руд (*Курская магнітная анамалія*).

ЖАЛЕ́ЗНАЕ ДРЭ́ВА, назва дрэў з розных сям. з незвычайна цвёрдай і цяжкай драўнінай. Вядома каля 100 відаў, пераважна трапічныя. Ж.д. называюць паротыю, віды каркасу, самшыту, сінопсісу (Паўд. Амерыка), тазалію ланцэтную (трапічная Азія, Афрыка, Мадагаскар), мезую жалезную (Індыя), стадманію моцнадраўнінную (в-аў Маўрыкій), іксору жалезную (Антыльскія а-вы), акацыю высокую (Аўстралія) і інш. Драўніну Ж.д. выкарыстоўваюць для выцв-сці ручак інструментаў, дэталей прылад і прыбораў, паляў і інш.

ЖАЛЕ́ЗНАЯ ГАРА́, гара на Паўн. Каўказе, паблізу г. Пяцігорск, у Расіі. Выш. 852 м. Уяўляе сабой *лакаліт*, складзены трахіліпарытамі. Шматлікія выхады мінер. крыніц, на базе якіх узнік курорт *Жалезнаводск*. На схілах шыракалістыя лясы.

«ЖАЛЕ́ЗНАЯ ГВА́РДЫЯ» («Garda de fier»), фашысцкі рух у Румыніі ў 1930—44. Узнікла на базе нацыяналіст., хрысц.-містычнай і антысеміцкай арг-цыі «Легіён Міхаіла Архангела» (засн. ў 1927) на чале з К.Кадрану. Прапагандавала ідэі нац. выключнасці румынаў, ліквідацыі сац. несправядлівасці, узмацнення пазіцый сялянства і інш. За тэрарыст. дзейнасць (у т.л. забойства прэм'ер-міністра І.Г.Дукі) у 1934 забаронена, у 1935 адноўлена як партыя «Усё для айчыны», у 1938 зноў забаронена. У 1940 як «Рух легіянераў» (лідэры Х.Сіма і інш.) удзельнічала ў фарміраванні ўрада ген. І.Антанеску. Канчаткова забаронена пасля вызвалення Румыніі ў 1944. *Н.П.Ракіцкая.*

ЖАЛЕ́ЗНІЦА (Sideritis), род кветкавых раслін сям. яснотковых. Больш за 60 відаў. Пашыраны ў Міжземнамор'і і ўмераных абласцях Паўн. паўшар'я. На Беларусі трапляецца Ж. горная (S. montana), рэдкі заносны від, расце на чыг. насыпах.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны і паўкусты. Сцябло прамастойнае або каля асновы ўзыходнае, чатырохграннае, лямцавакасматае. Лісце лапацістае або эліпсоіднае, з падоўжанымі жылкамі, якія пераходзяць у зубчыкі, з шыпікамі, на кароткіх чаранках. Кветкі двухгубыя, светла-жоўтыя, з чырвонакарычневым адгінам, у шматлікіх кальчаках, сабраных у несапраўдныя каласы. Плод — арэшак. Атрутная для коней.

ЖАЛЕ́ЗНЫ БЛЯСК, мінерал, крышт. разнавіднасць *гематыту* з метал. бляскам.

ЖАЛЕ́ЗНЫ ВЕК, апошняя (пасля каменнага і бронзавага вякоў) археал. эпоха ў гісторыі чалавецтва, якая характарызуецца пашырэннем металургіі жалеза і жал. вырабаў. *Жалеза* пазней за інш. металы (медзь, бронзу, волава) асвоена чалавекам з-за больш складанага выцв. працэсу. Асобныя рэчы з чыстага (метэарытнага) жалеза былі вядомы яшчэ ў 3—2-м тыс. да н.э. У 15 ст. да н.э. жалеза з бурага жалезняку выраблялі ў Месапатаміі і Егіпце, з 9 ст. да н.э. — у Кітаі і Індыі, у 8—7 ст. да н.э. — у Еўропе. Храналагічныя рамкі Ж.в. вызначаны ад 9—7 ст. да н.э., калі большасць плямён Еўропы і Азіі пачала здабываць і апрацоўваць жалеза, да ўзнікнення ў іх класавага грамадства і дзяржаў. У Зах. Еўропе ён падзяляецца на гальштацкі (900—600 да н.э.), латэнскі (500—100 да н.э.) і рымскі (да 350 н.э.) перыяды. Для ранняга Ж.в. характэрны пераход ад бронзы да жалеза. *Гальштацкая культура* была пашырана на тэр. Аўстрыі, Югаславіі, Паўд. Германіі, Паўд.-Зах. Чэхіі, Славакіі, Паўн. Францыі. Блізкай да гальштацкай была культура фракійскіх плямён, якія жылі на У Балканскага п-ва. На Пірэнейскім п-ве была пашырана іберыйская культура, у бас. Віслы і Одэра — *лужыцкая культура*. Для латэнскай культуры характэрна поўная перавага жал. прылад працы і зброі. На тэрыторыях, заваяваных Рымам, узнікла правінцыяльная рымская культура, паміж Паўночным м., Рэйнам, Дунаем і Эльбай — культура германскіх плямён, на У ад Одэра і Эльбы — *пшэворская культура*, якую даследчыкі звязваюць са слав. плямёнамі венедаў. У канцы Ж.в. ў славян і германцаў узнікаюць дзяржавы. Ва Усх. Еўропе найб. раннія жал. рэчы 10—9 ст. да н.э. выяўлены на ніжняй Волзе і Северскім Данцы. У 7 ст. да н.э. ў стэпах Паўн. Прычарнамор'я жылі *скіфы*; паміж Донам і Уралам у 8—3 ст. да н.э. — блізкія да іх па мове і культуры *сарматы*. У 2 ст. н.э. на тэр. Правабя-

Жалезніца горная.

рэжнай Украіны іх змянілі плямёны *чарняхоўскай культуры*, у Левабярэжнай Украіне і на Доне — *аланы*. У Волга-Камскім бас., на правабярэжжы Волгі, верх. Волзе і Волга-Окскім міжрэччы жылі плямёны ананьінскай, п'янаборскай, дзякоўскай культур (гл. адпаведныя арт.). Жалеза адыграла вял. ролю ў развіцці прадукцыйных сіл. Зробленыя

Да арт. **Жалезны век**. Жалезныя сякеры 4—1 ст. да н.э. з гарадзішча Гарошкаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл. і 3—1 ст. да н.э. з гарадзішча Звязда Лепельскага раёна Віцебскай вобл.

з яго прылады працы былі значна мацнейшыя за каменныя і бронзавыя. Узніклі ўмовы для накаплення матэрыяльных каштоўнасцей, паявілася маёмасная няроўнасць, паглыбіўся распад першабытнаабшчынных адносін, абвастрыліся супярэчнасці паміж родамі і плямёнамі. Гэта паспрыяла ўзнікненню прыватнай уласнасці, класаў і дзяржавы.

На тэр. Беларусі чорная металургія з'явілася ў 7—6 ст. да н.э. Жалеза здабывалі з балотнай руды ў невялікіх паўшарападобных печах-домніцах. Найб. стараж. жал. вырабы знойдзены на помніках *мілаградскай культуры* (Палессе, Верх. і Сярэдняе Падняпроўе). У носьбітаў *штрыхаванай керамікі культуры* і плямён *днепра-дзвінскай культуры* (бас. верх. Дняпра і сярэдняй Зах. Дзвіны) жалеза з'явілася ў канцы 1-га тыс. да н.э. З 3—2 ст. да н.э. да 1—2 ст. н.э. землі Палесся, Верх. і Сярэдняга Падняпроўя засялялі плямёны *зарубінецкай культуры*. У 2 ст. на тэр. бел. Падняпроўя і прылеглых да яго раёнаў жылі плямёны *кіеўскай культуры*. У зах. Палессі ў 2—4 ст. н.э. рассяліліся носьбіты *вельбарскай культуры*. У пераходны перыяд да сярэднявечча (5—6 ст.) на Пд Беларусі пашырылася *пражская культура*. У Сярэднім Падняпроўі склалася *калочынская культура*. У 5—7 ст. у Цэнтр., Паўн. Беларусі сфарміраваліся *банцараўская культура* і *тушамлінская культура*. Паводле археал. даследаванняў, плямёны Ж.в. на тэр. Беларусі знаходзіліся на стадыі развітога патрыярхату. Асн. адзінкай грамадства была вял. патрыярхальная сям'я, якая аб'ядноўвала 1—4 пакаленні бліжэйшых суродзічаў. Некалькі сем'яў складалі род, які валодаў пэўнай тэрыторыяй з паселішчам, умацаваным валамі і равамі (гл. *Гарадзішча*), пашай для жывёлы, апрацаваным полем. Пазней асн. формай паселішчаў стала неўмацаванае *селішча*. З пашырэннем ворыўнага земляробства ўзнікла асобная гаспадарка малой сям'і. Такія сем'і ўтваралі сельскую абшчыну, члены якой былі звязаны кругавой парукай, узаемнай адказнасцю за вынікі гасп. дзейнасці, захаваннем і размеркаваннем уласнасці, падтрыманнем норм традыц. права. Склаліся ўмовы для фарміравання пастаяннай дружыны. У 6—9 ст. адбываўся пераход да класавага грамадства. У працэсе разбурэння родаплемянных сувязей грамадства перайшло ад стадыі ваеннай дэмакратыі да *феадалізму*.

Літ.: Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 1. Мн., 1970; Монгайт А.Л. Археология Западной Европы: Бронзовый и железный века. М., 1974; Граков Б.Н. Ранний железный век: (Культуры Зап. и Юго-Вост. Европы). М., 1977.

В.С.Вяргей, А.В.Іоў, М.І.Лашанкоў, А.Р.Мітрафанаў.

ЖАЛЕ́ЗНЫ КАЛЧАДА́Н, тое, што *пірыт*.

ЖАЛЕ́ЗНЫ КАПЯЛЮ́Ш, намнажэнне аксідаў і гідрааксідаў жалеза каля паверхні Зямлі, якое ўзнікае ў выніку хім. раскладання і акіслення сульфідных руд. Залягае на першасных неакісленых рудах, перакрываючы іх (адсюль назва «капялюш»). Складаецца з *гётыту*, гідрагётыту, тур'іту з прымесямі гідрааксідаў марганцу, сульфатаў. Глыбіня распаўсюджання Ж.к. звычайна абмяжоўваецца ўзроўнем грунтавых вод і дасягае дзесяткаў і соцень метраў. Важная прыкмета пры пошуку сульфідных радовішчаў і ацэнцы першасных руд.

У.Я.Бардон.

ЖАЛЕ́ЗНЫ ШПАТ, тое, што *сідэрыт*.

ЖАЛЕ́ЗНЫЯ РУДЫ, прыродныя мінеральныя агрэгаты, якія маюць у сабе жалеза ў выгаднай для здабычы колькасці. Галоўныя рудныя мінералы: аксіды жалеза — *магнетыт*, *гематыт*, мартыт; гідрааксіды — *гётыт* і гідрагётыт; карбанаты — *сідэрыт*; сілікаты — шамазіт, цюрынгіт. Прамысл. Ж.р. маюць 16—72 % жалеза. У плаўку ідзе абагачаны да 60—70% канцэнтрат (гл. *Абагачэнне карысных выкапняў, Агламерацыя*). Карысныя прымесі: нікель, кобальт, марганец, вальфрам, малібдэн, хром, ванадый і інш. Шкодныя прымесі: сера, фосфар, цынк, свінец, мыш'як, медзь. У залежнасці ад паходжання вылучаюць Ж.р. эндагенныя (магматычныя, гідратэрмальныя, вулканагенна-асадкавыя і інш.), экзагенныя (асадкавыя пластавыя, радовішчаў выветрывання і інш.) і метамарфагенныя (жалезістыя кварцыты і інш.). Прамысл. тыпы класіфікуюць паводле пераважнага руднага мінералу (магнетытавыя, гематытавыя, сідэрытавыя і г.д.). Найб. запасы і аб'ёмы здабычы Ж.р. прыпадаюць на дакембрыйскія жалезістыя кварцыты, менш пашыраны асадкавыя буражалезняковыя, а таксама скарнавыя, гідратэрмальныя і карбанатытавыя магнетытавыя руды. Адрозніваюць Ж.р. багатыя (больш за 50% Fe) і бедныя (менш за 25% Fe); бедныя падзяляюцца на лёгка- і цяжкаабагачальныя. Па агульных запасах Ж.р. краіны СНД займаюць 1-е месца ў свеце (больш за 100 млрд. т), на 2-м месцы Бразілія (34 млрд. т). Ж.р. выкарыстоўваюцца для выплаўкі чыгуну, сталі і ферасплаваў, невялікая колькасць — як прыродная фарба (вохра) ці як уцяжарвальнік свідравальных растворaў. На Беларусі ў зах. ч. выяўлены радовішчы Ж.р. у пародах крышт. фундаменту (г.п. Карэлічы Гродзенскай вобл., г. Стоўбцы Мінскай вобл.), а таксама шэраг рудапраяўленняў. Ж.р. ў іх прадстаўлены жалезістымі кварцытамі (*Аколаўскае радовішча жалезных руд*, Рубяжэвіцкае рудапраяўленне), ільменіт-магнетытавымі рудамі (*Навасёлкаўскае радовішча* і інш.) і магнетытавымі метасаматытамі.

Літ.: Геология и полезные ископаемые кристаллического фундамента и нижней час-

Да арт. **Жалезны век**. Гліняны ляпны посуд 2 ст. да н.э. — 2 ст. н.э. з бескурганнага могільніка Вароніна Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобл. і ўпрыгожанні 6 ст. да н.э. — 1 ст. н.э. з гарадзішча Івань Слуцкага раёна Мінскай вобл.

ти платформенного чехла Беларуси. Мн., 1996. *У.Я.Бардон.*

«ЖАЛЕЗНЯКО́Ў», пласкадонны рачны *манітор*, экіпаж якога вызначыўся ў Вял. Айч. вайну. Пабудаваны ў 1934—36 у Кіеве. Уваходзіў у склад Дняпроўскай (ліст. 1936 — жн. 1940), Дунайскай (жн. 1940—ліст. 1941, крас. 1944—45) і Азоўскай (ліст. 1941—кастр. 1942, люты 1943—крас. 1944) ваен. флатылій, Чарнаморскага флоту (кастр. 1942 — люты 1943). Меў 6—7 гармат (у гады вайны і некалькі зенітных гармат), 3—4 кулямёты, экіпаж 70—72 чал. Удзельнічаў у абароне Адэсы, Нікалаева, Ачакава, Херсона, Севастопаля (1941), Бярдзянска, Цемрука (1942) і інш., у Будапешцкай аперацыі 1944—45; прайшоў 40 тыс. км, знішчыў 13 артыл. батарэй, 4 батальёны ням.-фаш. пяхоты і інш., адбіў 127 паветр. атак. У 1967 установлены як карабель-помнік на набярэжнай у Кіеве. *У.Я.Калаткоў, Р.К.Паўловіч.*

ЖАЛЕ́ЙКА, старажытны духавы язычковы музычны інструмент класа аэрафонаў. Вядома ў бел., рус., укр. народаў (на Беларусі наз. таксама дудка, ражок, пішчык, чаротка). Ж. — важны канструкцыйны элемент *дуды*. Канструкцыя Ж. пры захаванні вызначальнай адзінкі — адзінарнага язычка-пішчыка — дапускае варыянтнасць інш. элементаў. Мясц. разнавіднасці Ж. адрозніваюцца матэрыялам (дрэва, саломіна, гусінае пяро, чарот, рог), колькасцю адтулін (4—12, ёсць і без іх), адсутнасцю або наяўнасцю раструба, прынцыпамі вырабу і мацавання язычка (наразны або прывязаны), памерамі (100—360 мм). Гучанне моцнае, рэзкае, крыху гугнявае. Іралі на Ж. сола і ў ансамблі са скрыпкай, цымбаламі, гармонікам паасобку і ў розных камбінацыях (часам і з барабанам). У рэпертуары жалеечнікаў песенныя і танц. мелодыі, вясельныя маршы, часам пастухоўскія сігнальныя найгрышы. Інструмент быў пашыраны ва ўсёй Беларусі ў музыкантаў-прафесіяналаў і аматараў, у т.л. пастухоў. У пач. 20 ст. ўведзена В.*Андрэевым* у аркестр рус. нар. інструментаў. З сярэдзіны 19 ст. выцясняецца *кларнетам*. У наш час трапляецца рэдка. Ж. апета ў бел. нар. песнях і ў прафес. паэзіі (першы зб. вершаў Я.Купалы наз. «Жалейка», 1908). *І.Дз.Назіна.*

ЖАЛІ́БА Барыс Мікалаевіч (1.10.1949, г. Ходараў, Украіна), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1992), праф. (1995). Скончыў Бел. дзярж. ін-т нар. гаспадаркі (1970). З 1972 у Бел. дзярж. тэхнал. ун-це (з 1993 заг. кафедры эканомікі). Даследуе праблемы рыначнага гасп. механізму, інтэнсіфікацыі і павышэння эканам. эфектыўнасці вытв-сці на прадпрыемствах лясного комплексу ва ўмовах розных форм уласнасці.

Тв.: Эффективность ведения лесного хозяйства Белоруссии. Мн., 1986; Повышение эффективности использования лесосырьевых ресурсов БССР. Мн., 1989 (у сааўт.); Хозрасчет и эколого-экономическая оценка земельных и лесных ресурсов в лесхозах Беларуси. Мн., 1993 (разам з А.Д.Янушкам, М.М.Санковічам).

І.Жаліо-Кюры.

Ф.Жаліо-Кюры.

І.У.Жалтоўскі.

ЖАЛІО́-КЮРЫ (Joliot-Curie) Ірэн (12.9.1897, Парыж — 17.3.1956), французскі фізік і радыяхімік, грамадскі дзеяч. Замежны чл.-кар. АН СССР (1947). Дачка П.*Кюры* і М.*Складоўскай-Кюры*. Скончыла Парыжскі ун-т (1920). З 1918 у Ін-це радыю (з 1934 дырэктар), адначасова ў Камісарыяце па атамнай энергіі. Навук. працы па радыеактыўнасці, ядз. фізіцы і радыяхіміі. Разам з мужам Ф.*Жаліо-Кюры* адкрыла штучную радыеактыўнасць, у т.л. пазітронную радыеактыўнасць (1934), анігіляцыю і нараджэнне электронна-пазітронных пар (1933), правяла даследаванні, якія папярэднічалі адкрыццю нейтрона (1931). Чл. Сусв. Савета Міру, выступала супраць выкарыстання ядз. энергіі ў ваен. мэтах. Нобелеўская прэмія па хіміі 1935 (разам з Ф.Жаліо-Кюры).

Тв.: Рус. пер. — Жолио-Кюри Ф. Избр. труды. Фредерик и Ирен Жолио-Кюри. Совместные труды. М., 1957.

Літ.: Кедров Ф. Ирен и Фредерик Жолио-Кюри. 2 изд. М., 1975; Кудрявцев П.С. Курс истории физики. 2 изд. М., 1982. С. 413—416.

ЖАЛІО́-КЮРЫ (Joliot-Curie) Фрэдэрык (19.3.1900, Парыж — 14.8.1958), французскі фізік і грамадскі дзеяч; заснавальнік сусв. Руху прыхільнікаў міру. Чл. Парыжскай АН (1943), замежны чл. АН СССР (1949). Скончыў Школу фізікі і дастасавальнай хіміі ў Парыжы (1923). Працаваў у Ін-це радыю (1925—30 і з 1956), у Нац. цэнтры навук. даследаванняў (у 1944—45 дырэктар), у Камісарыяце па атамнай энергіі (заснавальнік і кіраўнік у 1946—50), адначасова выкладаў у Сарбоне і Калежы дэ Франс. Навук. працы па ядз. фізіцы, радыяхіміі і ядз. тэхніцы. Разам з жонкай І.*Жаліо-Кюры* адкрыў штучную радыеактыўнасць (1934), анігіляцыю і нараджэнне электронна-пазітронных пар (1933), правёў даследаванні, якія папярэднічалі адкрыццю нейтрона (1931). Прадказаў прынцыповую магчымасць ланцуговай ядз. рэакцыі (1939). Пад яго кіраўніцтвам пачаты (1839) і завершаны (1948) работы па стварэнні першага франц. атамнага рэактара. Першы старшыня Сусв. Савета Міру (з 1950), выступаў супраць выкарыстання ядз. энергіі ў ваен. мэтах. Яго імем названы Залаты медаль Міру (1959). Нобелеўская прэмія па хіміі 1935 (разам з І.Жаліо-Кюры), Міжнар. Ленінская прэмія 1951.

Тв.: Рус. пер. — Избр. тр. — Фредерик и Ирен Жолио-Кюри. Совместные труды. М., 1957.

Літ.: Бикар П. Фредерик Жолио-Кюри и атомная энергия: Пер. с фр. М., 1962.

ЖАЛІ́ЎЕ, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Чавусы — в. Будзіна. Цэнтр сельсавета. За 12 км на Пн ад г. Чавусы, 53 км ад Магілёва, 16 км ад чыг. ст. Чавусы, 54 ж., 30 двароў (1997). Аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЖАЛКЕ́ЎСКІ, Жулкеўскі (Żółkiewski) Станіслаў (1547, Турынец каля г. Львоў, Украіна — 7.10.1620), ваенны і дзярж. дзеяч Рэчы Паспалітай. Гетман польны каронны (1588), каштэлян львоўскі (1590), ваявода кіеўскі (1608), гетман вял. каронны (1613), канцлер вял. каронны (1617). Удзельнічаў у ваен. дзеяннях пад Гданьскам у 1577 і ў паходах *Стафана Баторыя* ў Лівонскую

1

2

3

Жалейкі: 1 — жалейка; 2 — (злева направа) чаротка і пішчыкі; 3 — дудка язычковая.

вайну 1558—83, у т.л. ва ўзяцці Полацка (1579), аблозе Пскова (1581). У час бескаралеўя (1587) падтрымаў кандыдатуру *Жыгімонта III* Вазы. Задушыў паўстанне С.*Налівайкі* (1596). Быў праціўнікам прагабсбургскай і антырас. палітыкі Жыгімонта III, але ў час ўзбр. выступлення шляхты на чале з М.Зебжыдоўскім выступіў на баку караля і ліквідаваў мяцеж (1607). У час *вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18* разбіў у 1610 каля в. Клушына рус. войскі, заняў Маскву і дамогся абрання на рас. трон каралевіча Уладзіслава. У 1620 узначальваў ваен. сілы Рэчы Паспалітай у вайне з Турцыяй. Загінуў у баі.

Тв.: Historia wojny moskiewskiej aż do opanowania Smoleńska... 9 wyd. Warszawa, 1966.

Літ.: Prochaska A. Hetman Stanisław Żółkiewski. Warszawa, 1927. *Н.К.Мазоўка.*

В.**Жалонкіна**. Эскізы касцюмаў да спектакля «Гуляем у прынца і жабрака» А.Журбіна.

ЖАЛО́НКІНА Вольга Мікалаеўна (н. 15.1.1956, г. Драгобыч, Украіна), бел. тэатральны мастак. Пасля сканчэння Растоўскага маст. вучылішча (1981) мастак па касцюмах Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі. Створаныя ёй касцюмы вызначаюцца вынаходлівасцю, дасціпнасцю вырашэння, дакладнасцю характарыстыкі персанажаў. Найб. адметныя касцюмы да спектакляў «Дзяніс Давыдаў» А.Мдывані і «Гуляем у прынца і жабрака» А.Журбіна (1985), «Клоп» У.Дашкевіча (1988), «Хэло, Долі!» Дж.Германа (1992), «Халопка» М.Стрэльнікава (1994), «Капялюш Напалеона» О.Штрауса (1996), «Цыганскі барон» І.Штрауса (1997) у т-ры муз. камедыі, оперы «Кармэн» Ж.Бізэ (1990) у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі.

Л.І.Дабравольская.

ЖАЛО́НЬ, Мухаедаўскі канал, рака на Украіне і ў Гомельскай вобл., правы прыток Прыпяці. Даўж. 113 км (12,8 км цячэ па Украіне, 33,8 км па мяжы з Беларуссю; 10,9 км зноў па Жытомірскай вобл., у нізоўі па Ельскім і Нараўлянскім р-нах). Пл. вадазбору 1460 км^2. Асн. прытокі — Яўрэйская канава, рэкі Ханя, Храпунь, Стрэлка і Верасожка (справа). Даліна невыразная. Пойма двухбаковая, парэзаная мелія-рац. каналамі, шыр. 30—300 м. Рэчышча амаль на ўсім працягу каналізаванае. Каналамі Свячанскі (рака да адгалінавання ад гэтага канала наз. Верхняя Жалонь), Антонаўскі і р. Гразіва злучана з р. Славечна.

ЖАЛТО́ЎСКІ Іван Уладзіслававіч (27.11.1867, г. Пінск Брэсцкай вобл. — 16.7.1957), бел. і рускі архітэктар, тэарэтык і педагог. Засл. дз. нав. і маст. Расіі (1932), засл. дз. маст. Беларусі (1944). Акад. Акадэміі архітэктуры СССР (1939—56) і Акадэміі буд-ва і архітэктуры СССР (1956). Ганаровы акад. АН БССР (1947). Вучыўся ў Пецярб. АМ (1887—98); з 1909 акадэмік архітэктуры. У 1953—59 узначальваў арх. майстэрню-школу Ін-та «Маспраект». У ранніх работах выкарыстоўваў кампазіцыйныя прыёмы і арх. матывы эпохі Адраджэння, пазней — формы класічнай архітэктуры. Адзін з аўтараў плана рэканструкцыі Масквы (1918—23). Праектаваў у Маскве шэраг павільёнаў Усерасійскай с.-г. і саматужна-прамысл. выстаўкі (1923), жылыя дамы на Ленінскім праспекце (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950), на Смаленскай пл. (1950), на праспекце Міру (1957), іпадром (1951—55), павільён СССР на Міжнар. выстаўцы ў Мілане (1925—26), тыпавыя праекты для індустрыяльна-зборнага буд-ва жылых дамоў і кінатэатраў. У 1941 пад яго кіраўніцтвам створаны праект гал. плошчы і драм. т-ра ў Гомелі.. Аўтар прац па тэорыі і практыцы архітэктуры. Пераклаў на рус. мову трактат італьян. арх. А.Паладыо (выд. 1938).

Літ.: И.В.Жолтовский: Проекты и постройки. М., 1955.

ЖАЛУ́ДАЧКІ ГАЛАЎНО́ГА МО́ЗГА, поласці ўнутры галаўнога мозга, дзе размешчаны сасудзістыя спляценні, што выпрацоўваюць цэрэбраспінальную вадкасць. Яна запаўняе Ж.г.м., потым па ліквараправодных шляхах выходзіць на аснову мозга і распаўсюджваецца па вонкавай паверхні галаўнога і спіннога мозга. Усяго Ж.г.м. — 4, поласці іх сазлучаныя. Пры паталогіі (вентрыкуліты, менінгаэнцэфаліты, кровазліцці, пухліны і інш.) парушаецца цыркуляцыя цэрэбраспінальнай вадкасці з частковай ці поўнай аклюзіяй ліквараправоднай сістэмы. Прыкметы: моцны галаўны боль, моташнасць, ірвота, галавакружэнне, павышаны артэрыяльны ціск і тэмпература цела, вокарухальныя і вестыбулярныя парушэнні. У цяжкіх выпадках — сімптомы ўшчымлення ствала галаўнога мозга, прыступы дэцэрэбрацыйнай рыгіднасці і інш.

Г.Дз.Сітнік.

ЖАЛУДО́К, гарадскі пасёлак у Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл. За 22 км ад г. Шчучын, 90 км ад Гродна, 12 км ад чыг. ст. Скрыбаўцы на лініі Масты—Ліда. 1,4 тыс. ж. (1997).

Вядомы з 2-й пал. 15 ст. як велікакняжацкае ўладанне. З 1486 мястэчка, да 1567 цэнтр павета Віленскага ваяв. У 16—17 ст. належаў Лацкім, Сапегам, Францкевічам. У лют. 1706 гал. кватэра шведскага караля Карла XII. У 18 — 1-й чвэрці 19 ст. ўласнасць Тызенгаўзаў. З 1795 у складзе Рас. імперыі, цэнтр воласці Лідскага пав. Віленскай губ. З 1830-х г. уладанне Урускіх, з пач. 20 ст. — Святаполк-Чацвярцінскіх. У 1897 — 1860 ж., нар. вучылішча, касцёл, сінагога, мясц. прам-сць. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Лідскага пав. Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 гар. пасёлак, цэнтр раёна. З 27.6.1941 да 12.7.1944 акупіраваны нямфаш. захопнікамі, разбураны. 9.5.1942 гітлераўцы расстралялі ў Ж. 2 тыс. сав. грамадзян. З 17.4.1962 у Шчучынскім р-не. У 1971 — 2,1 тыс. ж.

Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры — касцёл Ушэсця (1854) і сядзіба (пач. 20 ст.).

ЖАЛУДО́ЦКІ РАЁН, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў БССР у 1940—62. Утвораны 15.1.1940 у складзе Баранавіцкай вобл., з 1944 у Гродзенскай вобл. Цэнтр — г.п. *Жалудок*. Падзяляўся на 14 сельсаветаў, пл. 0,7 тыс. км^2 (1941). У 1962 тэр. перададзена ў Дзятлаўскі, Лідскі, Мастоўскі, Шчучынскі р-ны.

ЖА́ЛЬНІКІ, магілы 12—16 ст., абазначаныя абкладкай з камянёў, круглаватай, авальнай ці чатырохвугольнай формы, з 1—2 валунамі ў галавах, часам і ў нагах, з каменнымі крыжамі або накрытыя валунамі. На камянях і каменных крыжах часта высечаны знакі (крыжы, крыжыкі, краты, стрэлачкі, свастыкі і інш.). Большасць пахаванняў без інвентару, звычайна з адным пахаваннем у яме, галавой на З. Пашыраны пераважна на Наўгародчыне і Пскоўшчыне (Расія), дзе звязваюцца з прыбалтыйскафін. насельніцтвам, таксама ва Усх. Латвіі і некат. мясцінах Пн Беларусі (часцей у складзе курганна-жальнічных могільнікаў).

Л.У.Дучыц.

ЖАЛЮЗІ́ (франц. jalousie), 1) аканіцы, шторы з паралельных пласцінак, замацаваных у верт. або гарыз. становішчы

на раме (звычайна пад вуглом 45°) ці на шнурках (могуць устанаўлівацца пад любым вуглом). Выкарыстоўваюцца для засцярогі жылых і грамадскіх памяшканняў ад сонечных прамянёў, атм. ападкаў, пылу. 2) Паваротныя метал. створкі, якія ўстанаўліваюцца перад масляным або вадзяным радыятарам сістэмы ахаладжэння аўтамабіля і інш. машын для рэгулявання патоку паветра, што праходзіць праз радыятар.

Да арт. **Жальнікі**. Курганна-жальнікавае пахаванне 11—14 ст. каля в. Сухая Гара Лагойскага раёна Мінскай вобл.

ЖАЛЯ́БАЎ Андрэй Іванавіч (29.8.1851, с. Султанаўка, Рэспубліка Крым, Украіна — 15.4.1881), расійскі рэвалюцыянер-народнік. Скончыў Керчанскую гімназію (1869), вучыўся ў Новарасійскім ун-це ў Адэсе. За ўдзел у студэнцкіх хваляваннях (кастр. 1871) выключаны з ун-та і высланы. З 1873 чл. гуртка *чайкоўцаў*, вёў рэв. прапаганду сярод рабочых і інтэлігенцыі Адэсы. Удзельнік Ліпецкага і Варонежскага з'ездаў (1879), чл. выканаўчага к-та *«Народнай волі»*, сааўтар яе гал. праграмных дакументаў, у т.л. дэкларацыі. Адзін з удзельнікаў замаху на жыццё *Аляксандра II*; 27.2.1881 арыштаваны, асуджаны. Павешаны, тайна пахаваны на Праабражэнскіх могілках у Пецярбургу.

Літ.: Ходаковский М.П. Крым в биографии А.И.Желябова // История СССР. 1988. № 2.

ЖАЛЯЗНЕ́ННЕ, 1) нанясенне слоя жалеза на паверхню метал. вырабаў; разнавіднасць *металізацыі*. Робіцца *электралітычным асаджэннем*, газаполымным і плазменным напыленнем, выпарэннем і кандэнсацыяй жалеза ў вакууме. Выкарыстоўваецца для ўзнаўлення памераў зношаных дэталей, павышэння зносаўстойлівасці дэталей, якія труцца, ліквідацыі дэфектаў у адліўках; у паліграфіі — для вырабу *клішэ* спосабам *гальванапластыкі*, нанясення жал. пакрыццяў на медныя пласцінкі спосабам *гальванастэгіі* (для аховы іх ад акіслення друкарскай фарбай) і павышэння тыражаўстойлівасці стэрэатыпаў (гл. *Стэрэатыпія*). 2) Уціранне цэменту ў бетонныя паверхні заціральнай машынай або стальной цёркай да паяўлення метал. бляску. Робіцца для павышэння трываласці на сціранне і шчыльнасці бетонных пакрыццяў.

ЖАЛЯЗНО́Ў Мікалай Іванавіч (28.10.1816, С.-Пецярбург — 27.1.1877), рускі батанік і аграном. Акад. Пецярбургскай АН (1857). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1838). З 1847 праф. Маскоўскага ун-та, у 1861—69 арганізатар і дырэктар Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі ў Маскве. З 1858 першы прэзідэнт Рас. т-ва садоўніцтва. Навук. працы па раслінаводстве, эмбрыялогіі і фізіялогіі раслін.

ЖАЛЯЗНЯ́К Рыгор Самуілавіч (вер. 1914, г. Віцебск — 1942), бел. паэт. Скончыў Ленінградскі ун-т (1938). Загінуў пры абароне Ленінграда. У 1931—32 працаваў у рэдакцыі газ. «Віцебскі пралетарый». Друкаваўся з 1931. У вершах славіў працоўны энтузіязм моладзі, поспехі сацыялісг. буд-ва (зб. «Першы вытап», з Б.Люгоўскім, 1933; «Вясновыя будні», 1934). Напісаў кандыдацкую дысертацыю «Паэзія М.А.Багдановіча» (1940).

Тв.: У кн.: Мы іх не забудзем. Мн., 1949; У кн.: Крывёю сэрца. Мн., 1967.

ЖАЛЯЗО́ЎСКІ Анатоль Пятровіч (н. 5.2.1943, в. Крапіўна Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), бел. празаік. Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1968). З 1987 дырэктар Дома літаратара, з 1989 намеснік старшыні СП Беларусі, з 1994 старшыня праўлення Бел. літ. фонду. Друкуецца з 1973. Уздымае маральна-этычныя праблемы жыцця сучасніка (кн. прозы «Пералом», «Чаканне шчасця», «Ідў з надзеяй», усе 1981, «Горкі хлеб», 1985, п'еса «Людзі ліхалецця», 1997).

ЖАЛЯЗО́ЎСКІ Ігар Мікалаевіч (н. 1.7.1963, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. спартсмен (скарасны бег на каньках). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1984). Засл. майстар спорту (1985), засл. дз. фіз. культуры Беларусі (1994). Чэмпіён свету (1985, 1986, 1989, 1991—93) і ўладальнік Кубка свету 1992—93 у спрынтарскім мнагабор'і, сярэбраны (1994) і бронзавы (1988) прызёр зімовых XVII і XV Алімпійскіх гульняў на дыстанцыі 1000 м, рэкардсмен свету на дыстанцыі 1500 м, неаднаразовы чэмпіён і рэкардсмен СССР, пераможца Спартакіяды народаў СССР (1986, на 1000 і 1500 м). З 1996 прэзідэнт Паралімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь.

ЖАМЕ́РЫНЫ, адходы алейна-экстракцыйнай і цукровай вытв-сці. Атрымліваюць шляхам экстрагавання алею з насення алейных культур або соку з караняплодаў цукр. буракоў. Бываюць Ж. свежыя, сіласаваныя (кіслыя) і сухія (выкарыстоўваюць пераважна на корм с.-г. жывёле). У свежых бурачных Ж. больш за 90% вады, сухое рэчыва ў іх складаецца ў асн. з вугляводаў, у т.л. з

Р.С.**Жалязняк**.

цукроў. Сухія Ж. — каштоўны вугляводзісты канцэнтраваны корм, могуць выкарыстоўвацца як кампаненты *камбікармоў*, кармавых сумесей, а таксама служаць асновай гранул і брыкетаў.

ЖАМЖУ́РАЎ Міхаіл Леанідавіч (н. 21.11.1956, Мінск), бел. вучоны ў галіне ядз. тэхнікі і тэхналогіі. Д-р тэхн. н. (1995). Скончыў Маскоўскі інж.-фіз. ін-т (1980). З 1980 у Ін-це радыеэкалагічных праблем Нац. АН Беларусі. Навук. працы па дыягностыцы і радыяцыйна-тэхнал. кантролі стану рэактарных установак, тэхналогіі работ з адходамі дэзактывацыі. Распрацаваў комплекс метадаў для радыяцыйна-тэхнал. кантролю і сістэм ранняга прагназавання аварыйных сітуацый у ядз. тэхніцы.

Тв.: Разработка методов КГО ТВС с матричным топливом и их применение при перегрузке энергетического ядерного реактора (разам з В.А.Лявадным, В.В.Бурносам) // Атомная энергия. 1992. Т. 72, вып. 3; Дезактивационные работы // Последствия Чернобыльской катастрофы в Республике Беларусь. Мн., 1996.

ЖАМО́ЙТЫ, жэмайты, жмудзь, гістарычная назва старажытных балцкіх плямён, якія ў 1-м тыс. н.э. пражывалі ў зах. частцы Літвы на З ад р. Дубіса і на Пн ніжняга цячэння Нёмана. У 5—13 ст. засялялі, магчыма, толькі цэнтр *Жамойці*. На ПнЗ іх суседзямі былі *куршы*, на З — ламатэны, на ПдЗ — скалвы, на ПнУ — *земгалы*. Куршы, скалвы і земгалы паступова зліліся з Ж. Цяпер Ж. — этнагр. група *літоўцаў*, якія жывуць пераважна на З Літоўскай Рэспублікі, гавораць на жэмайцкім дыялекце *літоўскай мовы*.

ЖАМО́ЙЦІН Алесь (Аляксандр Пятровіч, н. 17.8.1955, в. Малахоўцы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1982). Працаваў настаў-

нікам. З 1988 дырэктар Літ. музея Ф.Багушэвіча ў в. Кушляны Смаргонскага р-на. Друкуецца з 1981. Асн. тэматыка вершаў — гіст. мінулае Беларусі, думкі і пачуцці сучасніка (зб. «Азірнуўшыся — не скамянею», 1989). Даследуе бел. культуру 19 ст. Аўтар артыкулаў пра К.Каліноўскага, Ф.Багушэвіча, Я.Карловіча, філас.-публіцыстычных эсэ.

ЖАМО́ЙЦЬ, Жэмайція, Жмудзь, Самагіція, гістарычная і этнагр. вобласць на З Літвы. З 1260-х г. у складзе ВКЛ (акрамя прыморскага ўзбярэжжа разам з Клайпедай). На працягу 2-й пал. 13 — пач. 15 ст. вял. князі ВКЛ выкарыстоўвалі Ж. як сродак для вырашэння сваіх знешнепаліт. задач у адносінах з Тэўтонскім ордэнам. Паводле Дубіскіх (1382), Салінскага (1398) і Рацыёнжскага (1404) дагавораў вял. князі ВКЛ Ягайла, а пасля Вітаўт саступалі Ж. Тэўтонскаму ордэну. У выніку паўстанняў 1401 і 1409 Ж. вызвалілася з-пад улады ордэна. Пасля *Грунвальдскай бітвы 1410* і *Мельнскага дагавора 1422* канчаткова далучана да ВКЛ. У 1411—1795 існавала асобнае Жамойцкае староства. З 1413 пачалося хрышчэнне Ж. з язычніцтва ў каталіцкае веравызнанне. З 1795 у складзе Літоўскай, з 1801 — Віленскай, 1843 — Ковенскай губ. Рас. імперыі, з 1918 у складзе Літвы.

ЖАМЧУГО́ВА (сапр. Кавалёва) Праскоўя Іванаўна (31.7.1768, в. Беразіно Яраслаўскай вобл., Расія — 7.3.1803), руская актрыса, спявачка (сапрана). Прыгонная графа Н.П.Шарамецева, у 1798 атрымала вольную, у 1801 стала яго жонкай. Спевам вучылася ў Л.Сандуновай. У 1779—97 выступала ў шарамецеўскім т-ры. Валодала моцным гнуткім голасам прыгожага цёплага тэмбру і вял. дыяпазону, драм. талентам. У яе рэпертуары (каля 50 роляў) найб. вылучаліся партыі трагедыйнага плана: Эліяна, Люсіль («Самніцкія шлюбы», «Люсіль» А.Грэтры), Луіза, Аліна («Дэзерцір», «Аліна, каралева Галкондская» П.А.Мансіньі), Зелміра («Узяцце Ізмаіла» В.Казлоўскага) і інш.

Літ.: Маринчик П.Ф. Недопетая песня: Необычайная жизнь П.И.Жемчуговой. Л.; М., 1965.

ЖАМЧУ́ЖНАЯ, рака на ПдУ Кітая, гл. *Сіцзян*.

ЖАМЧУ́ЖНІЦЫ, група родаў *двухстворкавых малюскаў*, здольных утвараць *жэмчуг*. У прэсных водах Паўн. Еўразіі, Амерыкі, Цэнтр. Еўропы, Д. Усходу, Паўн. Японіі пашыраны 2 роды сям. прэснаводных Ж. Больш за 5 відаў. Жывуць у невял. празрыстых рэках і ручаях. Найб. вядомая Ж. еўрапейская, або звычайная (Margaritifera margaritifera), якая траплялася ў рэках паўн. ч. Беларусі да сярэдзіны 19 ст., потым знікла, занесена ў Чырв. кнігу. У родзе марскіх Ж. каля 10 відаў. Пашыраны ў субтрапічных і трапічных морах да глыб. 70 м каля берагоў Цэнтр. Амерыкі, Індыі, Цэйлона, Аўстраліі, Мадагаскара, Японіі, у Чырвоным і Міжземным морах. Найб. вядомыя: Pinctada martensii, P. margaritifera, P. vulgaris.

Даўж. ракавіны да 30 см, маса да 10 кг (Pinctada), знутры ўкрыта тоўстым слоем *перламутру*. «Замок» утвораны адным «зубам» на правай створцы ракавіны і двума на левай (прэснаводныя Ж.). Створкі ракавіны ўнутры высланы 2 скурнымі складкамі — «мантыяй». Органы дыхання — шчэлепы. Раздзельнаполыя. Апладненне знешняе. Яйцы адкладвае ў шчэлепы. Лічынкі (глахідыі) паразітуюць на скуры і шчэлепах рыб, потым апускаюцца на дно і развіваюцца. Біяфільтратары. Растуць марудна: прэснаводныя Ж. даўж. 12—13 см маюць узрост каля 70 гадоў, за 30—40 гадоў жамчужына дасягае 8 мм. Жывуць да 100—120 гадоў. Аб'екты промыслу. З пач. 20 ст. іх штучна разводзяць для атрымання жэмчугу. Выкарыстоўваюць таксама перламутр створак для розных вырабаў.

Жамчужніцы: 1 — еўрапейская; 2 — пінктады.

ЖАМЧУ́ЖНЫ, пасёлак у Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Мышанка, каля аўтадарогі Брэст—Мінск. Цэнтр сельсавета. За 12 км на З ад горада і чыг. ст. Баранавічы, 200 км ад Брэста. 3431 ж., 964 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

Забудоўваецца паводле генплана 1979 і праекта забудовы жылой зоны комплексу «Усходняе» (1980). Вызначаецца кампактнасцю, высокім узроўнем добраўпарадкаванасці. Жылая зона складаецца з малапавярховай секцыйнай (фарміруе грамадскі цэнтр) і сядзібнай забудовы. Шырока выкарыстаны тэрасы, веранды, лоджыі, малыя арх. формы, групы дэкар. дрэў. Кожная з вуліц адметная сваім аб'ёмна-прасторавым і каляровым вырашэннем. Зона адпачынку (скверы са стадыёнам, спарт. пляцоўкамі, малымі арх. формамі) прымыкае да ляснога масіву.

ЖАМЧУ́ЖЫН, рачны *манітор* Дняпроўскага атрада Пінскай ваен. флатыліі, які ўдзельнічаў у абарончых баях летам 1941. Пабудаваны ў 1934—36 у Кіеве. Меў на ўзбраенні 7 гармат і 3 кулямёты, экіпаж 72 чал. З 27.11.1936 у складзе Дняпроўскай ваен. флатыліі, удзельнічаў у паходзе Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь (1939). З 8.7.1940 у Дунайскай ваен. флатыліі. У пач. Вял. Айч. вайны абараняў вусце Дуная. У канцы ліп. 1941 пераведзены на Дняпро. Прыкрываў пераправы і адыход сав. войск на левы бераг Дняпра на Пд ад Кіева, каля гарадоў Ржышчаў і Канеў. Узарваны экіпажам 12.8.1941 пасля няўдалай спробы прарыву з Чаркасаў да Кременчуга.

Р.К.Паўловіч.

ЖАМЫСЛА́ЎЛЬ, вёска ў Суботніцкім с/с Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Гаўя. Цэнтр саўгаса. За 25 км на Пн ад Іўя, 176 км ад Гродна, 16 км ад чыг. ст. Юрацішкі. 532 ж., 179 двароў (1997). Спіртзавод. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — *Жамыслаўская сядзіба*.

ЖАМЫСЛА́ЎСКАЯ СЯДЗІ́БА, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры 18—19 ст. Створана ў в. Жамыслаўль (Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл.) на левым беразе р. Гаўя. Яе фарміраванне пачалося з 2-й пал. 18 ст. З 1805 уласнасць роду Умястоўскіх. У 1828 К.Умястоўскі па баках набытага 1-павярховага драўлянага сядзібнага дома (у стылі барока) паставіў 2 мураваныя афіцыны з калоннымі порцікамі ў стылі класіцызму (захаваўся адзін), лядоўню, аранжарэю і манеж. Яго жонка дабудавала палац (да 1877), які існуе і цяпер. У канцы 19 ст. ўладальнік У.Умястоўскі аддаў сядзібу пад навук. базу Віленскаму ун-ту. У час. 1-й сусв. вайны (1914) у сядзібе немцы стварылі курорт. Захаваліся палац, гасп. будынкі, вінакурня (1885), парк. Планіровачнае ядро ансамбля — мураваны палац і 2 сіметрычна пастаўленыя флігелі, якія ўтвараюць парадны партэр з круглым газонам. Цэнтр. алею перад палацам замыкае мураваная альтанка са

Пасёлак **Жамчужны**. Фрагмент забудовы.

скульптурай Маці Божай (1883). Палац пабудаваны па аналогіі з варшаўскай рэзідэнцыяй 18 ст. Лазенкі, верагодна, паводле праекта арх. Л.Марконі. Т-падобны ў плане 2-павярховы будынак строга сім. кампазіцыі завершаны масіўным кубічным бельведэрам з шырокімі арачнымі вітражамі. У цэнтры гал. фасада лоджыя з каланадай і бакавымі антамі, у цэнтры дваровага — 4-калонны порцік з трохвугольным франтонам і трыгліфным фрызам. У вырашэнні фасадаў выкарыстаны *карынфскі ордэр*. У адной з залаў захавалася кафляная печ 18 ст. Уцалелі мураваныя склеп, стайня, млын, свіран (пач. 19 ст.). Парк пейзажнага тыпу (пл. каля 7 га) высаджаны ў 1883, падзелены ракой на 2 часткі: рэгулярна-парадную вакол палаца і пейзажную на зарэчным баку. Растуць ліпа звычайная, кедр сібірскі, бяроза далекарлійская і інш. *А.М.Кулагін.*

Жамыслаўская сядзіба. З малюнка Н.Орды.

ЖАНГАЛО́ВІЧ Іван Данілавіч (20.2.1892, г. Гродна — 29.7.1981), расійскі геадэзіст, гравіметрыст і астраном, адзін з заснавальнікаў касм. геадэзіі. Д-р фіз. матэм. навук (1946). Засл. дз. нав. Рас. Федэрацыі (1952). Скончыў Петраградскі ун-т (1916). З 1920 у Ін-це тэарэт. астраноміі АН СССР (у 1941—42 дырэктар, у 1943—66 нам. дырэктара), адначасова праф. Ленінградскага ун-та (з 1930). У 1920—30 і 1937—38 удзельнік палярных экспедыцый. Навук. працы па тэарэт., практычнай і эфемерыднай астраноміі, вывучэнні фігуры Зямлі, касм. геадэзіі, геафізіцы. Аўтар манаграфіі «Знешняе гравітацыйнае поле Зямлі і фундаментальныя пастаянныя, звязаныя з ім» (1952). У гонар Ж. названа малая планета.

А.М.Коратцаў.

ЖАНГАЛО́ВІЧ, малая планета № 1734. Сярэдні дыяметр 16 км, сярэдняя адлегласць ад Сонца 415,3 млн. км, перыяд абарачэння 4,6 г. Адкрыта ў 1928 у Крымскай астрафіз. абсерваторыі. Названа ў гонар І.Д.*Жангаловіча.*

Літ.: Коротцев О., Дахие М. Созвездие памяти: Косм. мемориал героев Вел. Отеч. войны. СПб., 1995.

ЖАНГЛІ́РАВАННЕ (ад франц. jongler), жанр цыркавога мастацтва, заснаваны на ўменні падкідваць і лавіць адначасова некалькі прадметаў. Адрозніваюць Ж.: партрэтнае — на цыркавым дыване з булавамі, кольцамі і інш. прадметамі; на конях, на дроце, матацыклах, драбінах; сілавое; Ж. т.зв. антыпадыстаў (жанглюючы нагамі).

Мастацтва Ж. вядомае са стараж. часоў (у Стараж. Егіпце, ант. Грэцыі і Рыме). У сярэднія вякі з Ж. выступалі вандроўныя нар. акцёры: жанглёры ў Францыі, мімы ў Італіі, шпільманы ў Германіі, хутляры ў Іспаніі, франты ў Польшчы, скамарохі ў Беларусі і Расіі. З 19 ст. Ж. —цыркавы жанр.

ЖАНДАРМЕ́РЫЯ (франц. gendarmerie ад gens d'armes узброеныя людзі), палітычная паліцыя. Як інстытут паліт. паліцыі ўпершыню ўведзена ў Францыі (1791). У Расіі ў 1792—1817 (з перапынкамі) існавала ў якасці ваен. паліцыі пры рас. арміі. З лютага 1817 набыла самаст. характар. У Пецярбургу і Маскве былі створаны жандарскія дывізіёны, а ва ўсіх губернскіх гарадах конныя жандарскія каманды. Пасля паўстання дзекабрыстаў Ж. стала сродкам барацьбы з рэв. рухам. У 1826 у Расіі існавала 59 розных па прызначэнні жандарскіх часцей і падраздзяленняў. У 1827 Ж. аб'яднана ў корпус жандараў (у 1837—67 і 1875—1917 — асобны корпус) і падпарадкавана кіраўніку Трэцяга аддзялення ў складзе імператарскай канцылярыі, які з 1839 стаў таксама начальнікам штаба корпуса Ж. У 1867 праведзена рэформа і прынята Палажэнне аб корпусе Ж., якое з нязначнымі зменамі дзейнічала да лют. 1917. Корпус Ж. ахоплівай усю імперыю і выконваў абавязкі паліт., коннай гарадской і ваен. паліцыі. Жандарскія падраздзяленні неслі абавязкі па выяўленні і расследаванні дзярж. злачынстваў, нагляду за турмамі і паліт. вязнямі, падтрыманні парадку на чыгункі. Ж. мела права весці вышук, тайнае назіранне, рабіць вобыскі і інш. У 1880 пасля скасавання Трэцяга аддзялення Ж. ўвайшла ў падпарадкаванне Мін-ва ўнутр. спраў. У 1882 створана пасада камандзіра Асобнага корпуса Ж. Ім стаў нам. міністра ўнутр. спраў, які курыраваў дэпартамент паліцыі. Бел. губернскія жандарскія ўпраўленні (Віленскае, Гродзенскае, Мінскае, Магілёўскае і Віцебскае) уваходзілі ў склад 4-й (Віленскай) жандарскай акругі. У губернскіх гарадах існавалі ўпраўленні жандарскіх штаб-афіцэраў. У буйных нас. пунктах губерняў размяшчаліся жандарскія каманды. У 1885 у 5 бел. губернях былі 24 павятовыя ўпраўленні (па 4 у Віленскай і Мінскай губ., па 5 у Гродзенскай і Магілёўскай, 6 у Віцебскай губ.), у якія ўваходзілі 24 обер- і 263 унтэр-афіцэры. У кожным губ. горадзе было гар. ўпраўленне з адпаведным штатам чыноў, пры Віленскім гар. упраўленні існавала конная каманда. На чыгунках, якія праходзілі праз тэр. Беларусі і Літвы, для падтрымкі грамадскага парадку дзейнічалі Віленскае і Мінскае чыг. жандарскія ўпраўленні. Жандарскія падраздзяленні на тэр. Беларусі прымалі ўдзел у падаўленні паўстання 1863—64, у выкрыцці рэв. гурткоў, дзеячаў рэв. руху. Ж. ліквідавана пасля Лют. рэвалюцыі 1917.

Літ.: Ерошкин Н.П. История государственных учреждений дореволюционной России. 3 изд. М., 1983; Курлов П.Г. Гибель императорской России. М., 1992; Новицкий В.Д. Из воспоминаний жандарма. М., 1991; Оржеховский И.В. Самодержавие против революционной России (1826—1880 гг.). М., 1982; Спиридович А. Записки жандарма. М., 1991. *І.В.Аржахоўскі.*

«ЖАНІ́ЦЬБА ЦЫРЭ́ШКІ», традыцыйнае гульнявое прадстаўленне «вяселля для ўсіх», прымеркаванае да *Каляд*. Паводле характару адпавядае карналізаванага-гульнявым звычаям (з абрадавым травесці), уласцівым культуры многіх еўрап. народаў. Пашырана на Бел. Паазер'і. Адлюстроўвае настрой калядных святкаванняў як «крывых вечароў» (з *амбівалентнасцю* дзеянняў «шыварат-навыварат»). Уключае некалькі этапаў: выбар са старэйшых удзельнікаў «бацькі» і «маці», якія потым «дабіраюць» і «жэняць» пары, «прыпяваюць» іх адзін да аднаго («Ай, роўная парачка — ім гарэлкі чарачка») і «скручваюць» у танцы (часцей «Лявоніха»); пачарговае «пералоўліванне» «маладых», агульнае застолле з песнямі і танцамі. Скразным элементам, які цэментуе ўсю гульню, з'яўляюцца рытуальныя «цярэшкінскія песні» з адметнай тыповай рытмаформулай. Разнастайныя тэксты «Ж.Ц.» амбівалентна пераафарбоўваюць драматызм сапраўднага вяселля ў гумарыстычным (часам гратэскавым) плане («Дзед бабу — чабок на дно, а мне, дзед, і тут ладно»). Умоўнасць «несапраўднага» гульнявога вяселля адзначана і ў «цярэшкінскіх песнях» («Мне з табой не век векаваць — адну ночаньку пагуляць»).

Літ.: Жаніцьба Цярэшкі. Мн., 1993.

З.Я.Мажэйка.

ЖА́ННА Д'АРК (Jeanne d'Arc; 1410 ці 1412, Дамрэмі-ла-Пюсэль, Францыя — 30.5.1431), нацыянальная гераіня Францыі, якая ўзначаліла адзін з этапаў вызв. барацьбы франц. народа супраць

англічан у *Стогадовую вайну 1337—1453.* 3 сял. сям'і. Апантаная містычнай верай у сваё прызначэнне вызваліць Францыю ад англічан, 4.3.1429 прыбыла ў г. Шынон, дзе дамаглася падтрымкі дафіна Карла. 8.5.1429 франц. войска на чале з Ж.д'А. зняло аблогу англічан з Арлеана (у народзе яе сталі называць Арлеанскай дзевай). Пасля шэрагу перамог яна павяла армію ў Рэймс, дзе 17.7.1429 адбылася каранацыя Карла VII. У вер. 1429 франц. войскі на чале з Ж.д'А. няўдала штурмавалі Парыж. 23.5.1430 у час дапамогі г. Камп'ен, абложанаму саюзнікамі англічан бургундцамі, Ж.д'А. узята ў палон і выдадзена англічанам. У лют. — маі 1431 на царк. судзе ў Руане яна абвінавачана ў ерасі і вядзьмарстве і спалена на кастры. 7.7.1456 рэабілітавана, 16.5.1920 кананізавана. Вобраз Ж.д'А. шырока адлюстраваны ў л-ры (У.Шэкспір, Вальтэр, Ф.Шылер, М.Твэн, Б.Шоу, Ж.Ануй), выяўл. мастацтве (Ж.Басцьен-Лепаж, П.Дэларош, Я.Матэйка і інш.), музыцы

Да арт. **Жанна д'Арк**. Спаленне Жанны д'Арк 30.5.1431 на плошчы Старога Рынку ў Руане. Фрагмент фрэскі ў Пантэоне. Парыж. Мастак Ж.Ланепво. 19 ст.

(Ф. Ліст, Дж.Вердзі, П.І.Чайкоўскі, А.Анегер).

Літ.: Перну Р., Клэн М.-В. Жанна д'Арк: Пер. с фр. М., 1992. *Дз.М.Чаркасаў.*

«ЖАНО́ЦКАЯ СПРА́ВА», часопіс у Заходняй Беларусі. Орган Аб'яднання бел. жанчын імя А.Пашкевіч (Цёткі). Выдаваўся ў сак.—ліст. 1931 у Вільні на бел. мове. Узнімаў актуальныя пытанні жыцця, побыту, грамадскага становішча жанчын Зах. Беларусі, інфармаваў пра паліт. і грамадскія падзеі, жаночы рух у розных краінах свету, змяшчаў літ. матэрыялы. Садзейнічаў пашырэнню нац. свядомасці бел. жанчын, яднаў іх на грунце грамадскай працы і агульнаасв. задач. Меў рубрыкі «Парады маці», «Пытанні і адказы», «Наша пошта» і інш. *А.С.Ліс.*

ЖАНО́ЧЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ І ГІМНА́ЗІІ, пачатковыя і сярэднія навуч. ўстановы ў Рас. імперыі. Адны з іх падпарадкоўваліся Ведамству ўстаноў імператрыцы Марыі (Марыінскія), другія — Мін-ву нар. асветы; *епархіяльныя вучылішчы* былі пад наглядам Сінода. Марыінскія вучылішчы былі 2 тыпаў: сярэднія (з 7-гадовым тэрмінам навучання, засн. ў 1858, у 1862 перайменаваны ў гімназіі) і з 4-гадовым тэрмінам навучання (з 1880-х г.). З канца 1880-х г. у Беларусі існавалі Мінскі і Віцебскі дзіцячыя прытулкі, Лепельскае 4-класнае вучылішча. У 1911 гімназіі былі ў Гродне, Віцебску, Мінску. Вучылішчы Мінва нар. асветы засн. ў 1858, падзяляліся на вучылішчы з 6-гадовым курсам навучання (1-ы разрад) і 3-гадовым (2-і разрад); у 1870 яны пераўтвораны ў гімназіі і прагімназіі. З 1876 такія вучылішчы працавалі ў Брэсце, Пружанах, Слоніме, Мсціславе, Нясвіжы, Ашмянах, Жыровічах, Віцебску, Мінску, Парычах (для дачок духавенства), Гарадоцкае руска-латышскае вучылішча, а таксама 10 жан. нар. вучылішчаў і жан. змены пры 36 прыходскіх і 7 нар. вучылішчах. Навучанне ва ўсіх жан. вучылішчах і школах Беларусі вялося на рус. мове. У 1913 працавалі 33 яўр. жан. навуч. ўстановы. Пасля 1912 засн. Гарадоцкае і Брэсцкае вышэйшыя жан. пач. вучылішчы, 16 вышэйшых пач. вучылішчаў супольнага навучання (Чачэрскае, Прапойскае, Жлобінскае і інш.). Да 1913 адкрыты жан. дзярж. гімназіі ў Гомелі, Мінску, Бабруйску, Брэсце, Віцебску, Ваўкавыску, Пінску, Клімавічах, Мазыры, Полацку, Слоніме, Слуцку і інш. Навучанне платнае. У канцы 1870-х г. у Беларусі было 21 прыватнае жан. вучылішча. Прыватныя гімназіі пачалі адкрывацца з 1872. Выпускніцам гімназій з 1881 прысвойвалася званне настаўніцы пач. школы. Гл. таксама *Віцебская Марыінская жаночая гімназія, Брэсцкія гімназіі, Гомельскія гімназіі, Гродзенскія гімназіі* і інш. *Г.Р.Сянькевіч.*

ЖАНО́ЧЫЯ ХВАРО́БЫ, спецыфічныя хваробы жанчын, звязаныя з анатамафізіял. асаблівасцямі іх арганізма. Бываюць у розныя перыяды жыцця жанчыны; выклікаюць парушэнні функцый палавых органаў, іншы раз жыццядзейнасці ўсяго арганізма. *Заганы развіцця* палавых органаў уласцівы жаночаму арганізму да надыходу палавой спеласці, запаленні — у перыяд палавой спеласці (бываюць ад ганарэі, абортаў, пасляродавых ускладненняў, радзей ад сіфілісу, туберкулёзу, трыхаманозу і інш.). У гэты перыяд могуць развівацца дабраякасныя і злаякасныя пухліны (фібраміёмы маткі, кісты яечнікаў, рак шыйкі і цела маткі). Паразітычныя і грыбковыя Ж.х. выклікаюцца грыбкамі (напр., малочніца) і гельмінтамі. Ж.х. бываюць, калі парушана размяшчэнне палавых органаў — пры зрушэнні маткі і сценак похвы ці іх выпадзенні. Самастойная група Ж.х. — парушэнні *менструальнага цыкла.* Пасля клімактэрыю (гл. *Клімакс*) запаленні жаночых палавых органаў бываюць радзей, але могуць развіцца пухліны (рак маткі, яечнікаў і інш.). Прыкметы Ж.х.: болі, белі, крывацёкі, агульныя сімптомы (павышэнне т-ры цела), расстройствы інш. органаў і сістэм (сардэчна-сасудзістай, нерв. і інш.). Лячэнне: медыкаментознае, хірургічнае. Гл. таксама *Бясплоднасць.* *І.У.Дуда.*

ЖАНР [франц. genre ад лац. genus (generis) род, від], у большасці відаў мастацтва ўнутранае падраздзяленне, якое склалася гістарычна; тып устойлівай структуры маст. твора, спосаб яго змястоўнай і кампазіцыйнай арганізацыі. Жанравая дыферэнцыяцыя залежыць ад спецыфікі відаў мастацтва. Асновай развіцця Ж. з'яўляецца складаны характар рэчаіснасці, патрэбнасць у адэкватным вобразным адлюстраванні пэўных тыпаў жыццёвых сувязей і адносін. Паэтыка кожнага Ж. заключаецца ў выбары маст. формул, спецыфіка якіх складае жанравы стыль. Ж. семантычна і марфалагічна арганізуе ўсе элементы вобразнай структуры, ён нараджаецца патрэбамі зместу і ў сваю чаргу ўплывае на знешнюю форму з дапамогай характэрных толькі для яго сродкаў выразнасці. Наяўнасць адносна ўстойлівых фармальных прыкмет, спецыфічнай мовы дазваляе аднесці Ж. да катэгорыі маст. формы, якая, аднак, не мае самастойнага эстэт. сэнсу і не з'яўляецца назаўжды зададзенай і завершанай. Усе структурныя элементы Ж. выступаюць носьбітамі актыўнай пазіцыі аўтара і абумоўлены яго светапоглядам, творчай манерай, метадам і інш. Незалежна ад уласцівых кожнаму віду мастацтва спецыфічных прынцыпаў падзелу на Ж. існуюць і агульныя канцэпцыі жанравай дыферэнцыяцыі: паводле прадмета характару адлюстравання, інфармацыйнай і пазнавальнай ёмістасці, спосабу пабудовы маст. вобраза і інш.

Тэрмін «Ж.» і жанравая класіфікацыя ўзніклі ў франц. эстэтыцы класіцызму ў 17—18 ст., але з 19 ст. страцілі строгія межы падзелаў і гал. ролю ў іерархічнай сістэме мастацтваў; нягледзячы на відавочную гістарычнасць паняцця Ж., у практыцы мастацтвазнаўства яго ўжываюць да ўсіх перыядаў гісторыі сусв. мастацтва, што тлумачыцца зручанасцю падзелу твораў паводле тэматыкі адлюстравання. У пластычных відах мастацтваў, дзе немагчыма вылучыць прадмет выявы (архітэктура, дэкар.-прыкладное мастацтва і інш.), жанравая класіфікацыя не прынята.

У выяўленчым мастацтве асн. прыкметы Ж. найперш вызначаюцца паводле прадмета выявы (*пейзаж, партрэт, бытавы жанр, гістарычны жанр, батальны жанр, нацюрморт* і інш.). Наступная больш дробная жанравая дыферэнцыяцыя абумоўлена зліццём у маст. творчасці пазнавальных, вобразна-мастацкіх, ідэйна-ацэначных

элементаў і наяўнасцю ў кожнага твора вызначанага функцыян. прызначэння. Так, у залежнасці ад ідэйна-ацэначнай пазіцыі мастака партрэт можа быць у форме *шаржу* ці *карыкатуры*, а ў залежнасці ад прызначэння — парадным, камерным, інтымным і інш. Новыя «паджанры» ўзнікаюць і пры падзеле на больш дробныя з'явы прадметаў выявы (*марына* — асобны від пейзажа, «галантны жанр» — адзін з відаў бытавога Ж. і інш.). Развіццё і эвалюцыя Ж. ў выяўл. мастацтве Беларусі абумоўлены асаблівасцямі яе гіст. развіцця (гл. ў арт. *Жывапіс*, *Графіка*, *Скульптура* і пра адпаведныя Ж.). У жывапісе 16—18 ст. пераважаў Ж. параднага (т. зв. сармацкага) партрэта (партрэт Крыштофа Весялоўскага, 1636, і інш.). Пейзажны Ж. у графіцы ўзнік у пач. 16 ст. (гравюра «Руф у полі», 1517—19, з Біблії Ф.Скарыны), у жывапісе склаўся ў канцы 18 — пач. 19 ст. («Зарослая сажалка» А.Гараўскага, 1857). З 19 ст. назіраецца спалучэнне Ж. («Партрэт жонкі з нацюрмортам» І.Хруцкага, да 1836), у 20 ст. — іх сінтэз (трыпціх «Незабыўнае» К.Касмачова, «Партызанская мадонна» М.Савіцкага, «Размова аб вечнасці. Скарына і Парацэльс» А.Марачкіна і інш.).

Улітаратуры пад Ж. разумеюць устойлівыя разнавіднасці твораў, што склаліся ў працэсе яе гіст. развіцця. Нярэдка ў гэтым значэнні ўжываецца паняцце *від літаратурны*. У аснове кожнага Ж. ляжыць пэўны характар адлюстравання жыцця, які выяўляецца ў адпаведнай форме твораў. Кожны з трох асн. родаў (*эпас*, *лірыка*, *драма*) мае свае Ж. Напр., да эпічнага роду адносяцца *раман*, *аповесць*, *апавяданне*, *навела*, да лірычнага — *песня*, *гімн*, *эпіграма*, *дыфірамб*, *ода*, *эпітафія*, *раманс* і інш., да драматычнага — *трагедыя*, *камедыя*, драма. Эпічныя Ж. адрозніваюцца адзін ад аднаго ступенню складанасці жыццёвага матэрыялу, працягласцю адлюстравання часу дзеяння, шырынёй ахопу з'яў рэчаіснасці, лірычныя — асаблівасцямі адлюстраваных у іх перажыванняў, пачуццяў, драматычныя — характарам жыццёвага матэрыялу і адносін аўтара да гэтага матэрыялу. Існуюць таксама «змешаныя» Ж., у якіх спалучаны прыкметы розных родаў, напр., ліраэпічныя Ж. (*паэма*, *балада*). Многія Ж. маюць у сабе элементы розных родаў (у рамане можа прысутнічаць лірычны або драм. элемент, у драме — эпічны і г.д.). Пры характарыстыцы маст. твораў вызначэнне Ж. можа быць недастатковым, таму акрамя паняцця «Ж.» ужываецца і тэрмін «жанравая форма», які выяўляе больш прыватныя асаблівасці твора. Так, Ж. рамана можа мець разнавіднасці: філасофскі, гістарычны, прыгодніцкі, дэтэктыўны і інш. Жанравая сістэма бел. л-ры такая, як і ў інш. еўрап. л-рах. Аднак некаторыя Ж., выкліканыя спецыфічнымі ўмовамі яе развіцця, ужо зніклі (напр., *гутаркі*), з'явіліся новыя (*драматычная паэма*).

Умузыцы паняцце Ж. абагульняе розныя бакі муз. твора і ўключае: жыццёвае прызначэнне і функцыю бытавання (адрозніваюць *прыкладную музыку*, што выконвае дапаможную функцыю, і прапанаваную, якая патрабуе адасаблення выканаўцы ад слухача і спец. ўстаноўку на эстэт. ўспрыняцце); спосаб і ўмовы выканання і ўспрыняцця (музыка выконваецца пэўным складам выканаўцаў, па фіксаваным тэксце або па-за ім, у канцэртнай зале, оперным т-ры, у хатніх умовах, на дыскатэцы і інш.); тыпізаваную змястоўную сферу; пэўныя стылістычныя адзнакі. Складанасць і шматсэнсоўнасць паняцця Ж. абумоўлены тым, што яго састаўныя часткі рознага парадку могуць уступаць адна з адной у разнастайныя спалучэнні. Змены ўмоў бытавання муз. твораў, узаемадзеянне фалькл., бытавых і прафес. Ж., развіццё муз. мовы вядуць да мадыфікацыі старых і фарміравання новых Ж. Таму ў муз. навуцы існуюць розныя сістэмы класіфікацыі Ж., адзіная ж тэорыя муз. Ж. знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. Адносна прафес. музыкі найб. пашырана класіфікацыя паводле складу выканаўцаў і спосабу выканання. У вак. музыцы вылучаюць Ж. чыста вакальныя (*хор* а капэла), у вак.-інструментальнай — камерна-вакальныя (сольная *песня*, *раманс*, вак. цыкл, розныя вак. ансамблі) і вак.-сімфанічныя (*кантата*, *араторыя*, *вакальна-сімфанічная паэма*), у інструментальнай — камерна-інструментальныя (*саната*, *сюіта*, *паэма*, *балада*, *рапсодыя*, *мініяцюра*, *трыо*, *квартэт*, *квінтэт* і інш. віды ансамбляў) і сімфанічныя (*сімфонія*, *сімфанічная сюіта*, *сімфанічная паэма*, *сімфаньета*, *канцэрт*, *увертюра*), муз.-сцэнічныя (*опера*, *балет*, *аперэта*, *мюзікл*). Усе Ж. атрымалі значнае развіццё ў бел. музыцы.

Укіназнаўстве ўжываюцца такія жанравыя вызначэнні, як кінараман, *кінааповесць*, *кінаэпапея*, кінапаэма, *дэтэктыўны фільм* і інш. Існуюць і больш вузкія жанравыя падраздзяленні: філасофская або лірычная кінааповесць, сатыр., эксцэнтрычная, муз. кінакамедыя, *музычны фільм*, паліт. кінадэтэктыў і інш. Вядомы такія Ж., як *вестэрн*, фільм жахаў, кінамюзікл і інш. Існуе тэндэнцыя да змешвання Ж., з'яўляюцца новыя жанравыя ўтварэнні. У бел. кінематографе прадстаўлены Ж.: гераіка-прыгодніцкі («Лясная быль»), кінаэпапея («Людзі на балоце»), эпічная кінадрама («Першы ўзвод»), сац.-псіхал. кінадрама («Двойчы народжаны») і кінааповесць («Іван Макаравіч»), кінакамедыя («Нашы суседзі»), гераіка-рамант. кінадрама («Канстанцін Заслонаў», «Чырвонае лісце»), гераічная кінаэпапея («Полымя»), гісторыка-рэв. кінааповесць («Масква—Генуя»), лірычная кінааповесць («Я родам з дзяцінства») і кінапаэма («Вянок санетаў»), дэтэктыў («Дзікае паляванне караля Стаха») і інш.

Жанр газетны — сістэма літ.-публіцыстычных форм у журналістыцы для асвятлення падзей паліт., эканам., сац. і культ. жыцця. Падзяляецца на 3 жанравыя групы: інфармацыйны (нататка, справаздача, *інтэрв'ю*, рэпартаж), пабудаваны на канкрэтных, пераважна аператыўных фактах; аналітычны (карэспандэнцыя, артыкул, агляд, рэцэнзія), які апрача канстатацыі фактаў патрабуе іх аналізу, ацэнкі; мастацка-публіцыстычны (замалёўка, эсэ, нарыс, фельетон, памфлет), набліжаны да маст. (белетрыстычных) твораў. У іх спалучаюцца лагічны, рацыянальны і вобразны пачаткі. У сучаснай журналістыцы пашыраны т.зв. «сінтэтычныя» Ж., у якіх для больш вобразнага і глыбокага раскрыцця падзей і характараў спалучаюцца элементы некалькіх Ж. (напр., нарыса і рэпартажу, артыкула і замалёўкі і інш.). Некаторыя элементы газетнага Ж. выкарыстоўваюцца таксама ў кіна-, тэле- і радыёжурналістыцы.

Літ.: Буало Н. Поэтическое искусство: Пер. с фр. М., 1957; Недошивин Г.А. Беседы о живописи. М., 1959; Каган М.С. Морфология искусства. Л., 1972; Бяспалы А.А. Выяўленчае мастацтва Беларусі і сродкі яго адлюстравання. Мн., 1994; Бахтин М.М. Вопросы литературы и эстетики. М., 1975; Цуккерман В.А. Музыкальные жанры и основы музыкальных форм. М., 1964; Сохор А. Теория музыкальных жанров: задачи и перспективы // Сохор А. Вопросы социологии и эстетики музыки. Л., 1983. [Т.]3; Власов М. Виды и жанры киноискусства. М., 1976; Шилова И.М. Проблемы жанров в киноискусстве. М., 1982; Газетные жанры. М., 1971; Стральцоў Б.В. Публіцыстыка. Жанры. Майстэрства. Мн., 1977.

М.А.Цыбульскі (агульная частка), *М.А.Лазарук* (літаратура), *А.А.Друкт* (музыка), *С.В.Говін* (Ж. газетны).

ЖАПУРА́, Япура (Japurá, Yapurá), рака ў Бразіліі і Калумбіі (дзе наз. Какета, Caquetá). Левы прыток р. Амазонка. Даўж. 1930 км, пл. бас. 282 тыс. км^2. Пачынаецца ў Цэнтр. Кардыльеры Калумбіі. У верхнім цячэнні, у Андах і ў зах. ч. Гвіянскага пласкагор'я парожыстая, на Амазонскай нізіне шырокая і спакойная, у ніжнім цячэнні ўтварае шматлікія рукавы, пратокі (адзін з іх злучаецца з Амазонкай на 600 км вышэй за вусце Ж.). Жыўленне дажджавое. Паводка з сак. да ліпеня. Сярэдні гадавы расход вады 17900 м^3/с. Суднаходная ў межах Бразіліі і на асобных участках у Калумбіі.

ЖАРАБЕ́Ц, палаваспелы самец каня. Племяннае выкарыстанне пачынаюць з 3-гадовага ўзросту. Пры адборы Ж. ўлічваюць паходжанне, канстытуцыю, працаздольнасць, палавую патэнцыю, пладавітасць. Ж. захоўваюць высокую патэнцыю пры аптымальных умовах утрымання да 16—20 гадоў.

ЖАРАБКО́ВІЧЫ, вёска ў Ляхавіцкім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Ляхавічы—Клецк. Чыг. ст. на лініі Баранавічы—Слуцк. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на У ад Ляхавіч, 232 км ад Брэста, 639 ж., 250 двароў (1997).

Сярэдняя школа, Палац культуры, б-ка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму.

ЖА́РАЎ Міхаіл Іванавіч (27.10.1899, Масква — 15.12.1981), рускі акцёр. Нар. арт. СССР (1949). Герой Сац. Працы (1974). Сцэн. дзейнасць пачаў у 1919. Працаваў у т-рах вандроўным франтавым, імя У. Меерхольда, Камерным т-рах. З 1938 у Малым т-ры. Стварыў яркахарактарныя, камедыйна-сатыр. і драм. вобразы: Аляксей («Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага), Прохар («Васа Жалязнова» М.Горкага), Мітрыч («Улада цемры» Л.Талстога), Варанцоў («Так і будзе» К.Сіманава) і інш. З 1924 здымаўся ў кіно. Як і ў тэатры, камедыйная лёгкасць спалучалася ў яго выкананні з псіхал. глыбінёй; пры стварэнні адмоўных персанажаў найб. ярка праяўлялася сатыр. завостранасць: «Пуцёўка ў жыццё», «Пётр I», «Абарона Царыцына», «У імя Радзімы», «Выбаргская старана», «Вяртанне Максіма», «Вясковы дэтэктыў». Здымаўся ў бел. фільмах: «Мядзведзь», «Чалавек у футарале», «Чырвонае лісце». Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942, 1947. Аўтар успамінаў «Жыццё, тэатр, кіно» (1967).

ЖАРГО́Н, гл. ў арт. *Арго*.

ЖАРДА́Н (Jordan) Мары Энмон Каміль (5.1.1838, г. Ліён, Францыя — 21.1.1922), французскі матэматык. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1895). Скончыў Політэхн. (1859) і Горную школы (1861) у Парыжы. З 1861 працаваў інжынерам, з 1873 у Політэхн. школе (з 1876 праф.), адначасова з 1875 у Калежы дэ Франс. Навук. працы па алгебры, тэорыі функцый, тапалогіі, крышталяграфіі, механіцы. Аўтар першага сістэм. курса па тэорыі груп і тэорыі Галуа (1870) і 3-томнага курса матэм. аналізу (1882—87).

Літ.: Стройк Д.Я. Краткий очерк истории математики: Пер. с нем. 2 изд. М., 1969.

ЖАРДАНО́Н, таксанамічная катэгорыя ніжэйшага рангу, чым *від*: група індывідуумаў, ідэнтычных марфалагічна, генетычна і экалагічна, здольных пастаянна захоўваць свае прыкметы ў культуры. Тэрмін прапанаваў галандскі батанік Я.Лотсі (1916) у гонар франц. батаніка А.Жардана, які вызначыў, што звычайны «лінеёўскі від» можна раскласці на вял. колькасць канстантных форм. Спадчынная ўстойлівасць прыкмет звязана з *апаміксісам*. Гэта значыць, што размнажэнне насеннем адбываецца ў спадчынна ўстойлівых форм таксама, як пры вегетатыўным размнажэнні. У аналітычнай сістэматыцы культ. раслін вылучэнне вял. колькасці ўнутрывідавых адзінак мае істотнае значэнне.

ЖАРДЗЯ́НКА, рака ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., правы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Даўж. 25 км. Пл. вадазбору 375 км². Пачынаецца за 2 км на У ад в. Славань. Асн. прыток — р. Чырка (злева). Рэчышча на ўсім працягу каналізаванае. Рака жывіць Светлагорскае вадасх.

ЖА́РКІН Уладзімір Васілевіч (н. 1.1.1931, в. Любавічы Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне заатэхніі. Д-р біял. н. (1988). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1953). У 1960—90 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі (з 1981 заг. лабараторыі). Навук. працы па арганізацыі і тэхналогіі ўзнаўлення буйн. раг. жывёлы, імуналагічных праблемах узнаўлення ў жывёлагадоўлі, штучным асемяненні.

Тв.: Воспроизводство // Справочник по скотоводству. Мн., 1984; Организация воспроизводства сельскохозяйственных животных. Мн., 1985 (разам з В.С.Антанюком, Л.Г.Бязлюднікавым).

ЖАРКО́Ў Ігар Васілевіч (23.6.1910, в. Месягутава, Башкортастан — 25.4.1974), бел. вучоны-заолаг. Д-р біял. н. (1969), праф. (1971). Скончыў Казанскі ун-т (1934). З 1969 у Гомельскім ун-це (заг. кафедры). Навук. працы па прамысл.-паляўнічых звярах, пытаннях жыўлення, метадах уліку прамысл. і ахоўных жывёл, методыцы феналагічных назіранняў, біялогіі і рэакліматызацыі рачнога бабра.

Тв.: Простейшие наблюдения в природе. 2 изд. М., 1956; Итоги расселения речных бобров в СССР. М., 1966.

ЖАРКО́Ў Леанід Васілевіч (н. 15.10.1946, в. Сцяпанава Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны-фармацэўт. Д-р фармацэўтычных навук (1992). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1973). З 1975 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, з 1994 загадчык-правізар цэнтр. раённай аптэкі ў Мінску.

ЖАРКО́ЎСКІ Даніла Уладзіміравіч (2.1.1904, в. Ходараўка Горацкага р-на Магілёўскай вобл. — 31.12.1987), бел. хімік. Д-р хім. н. (1966), праф. (1967). Скончыў Бел. лесатэхн. ін-т (1931) і Ленінградскую лесатэхн. акадэмію (1935). У 1936—41 і 1946—52 у Ін-це хіміі АН БССР, у 1956—66 у Бел. ін-це механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, у 1968—73 у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН БССР. Навук. працы па вывучэнні цэлюлозы і яе эфіраў, даследаванні працэсу мерсерызацыі.

Тв.: О механизме щелочного набухания целлюлозы (к теории мерсеризации) (у сааўт.) // Синтетические и природные полимерные материалы. Мн., 1974.

ЖАРЛЯ́НКА ЧЫРВАНАБРУ́ХАЯ (Bombina bombina), земнаводнае сям. круглаязычных атр. бясхвостых земнаводных. Пашырана ў Цэнтр. і Усх. Еўропе. Жыве ў плыткіх і зарослых вадаёмах з глеістым дном, на балотах, у лужынах і інш. На Беларусі трапляецца пераважна ў паўд., паўд.-зах. і цэнтр. раёнах.

Жарлянка чырванабрухая.

Даўж. цела 3,5—4,5 см (зрэдку да 6), маса 3—10 г. Спіна светла-шэрая, бураватая з цёмнымі плямамі, бруха яркa-аранжавае або чырвонае з сінявата-чорнымі плямамі. Скура з бародаўкамі, што выдзяляюць едкі сакрэт. Актыўная днём і вечарам. Карысная. Корміцца воднымі беспазваночнымі.

ЖАРНАСЕ́К Ірына Францаўна (н. 17.1.1953, в. Чаранкі Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. пісьменніца. Скончыла Мінскі ін-т культуры (1976). Друкуецца з 1978. Маральна-этычныя праблемы — тэма мацярынства, жаночыя турботы, мудрасць і высокая духоўнасць працоўнага чалавека, карані чалавечай спагады, дабрыні ў кн. апавяданняў «Ліст да сына» (1986), тэмы эміграцыі і гістарычныя ў кн. аповесцей «Гульні над студняй» (1993).

Жарновец мяцёлчаты.

ЖАРНО́ВЕЦ (Sarothamnus), род раслін сям. бабовых. Вядома 12 відаў. Пашыраны пераважна ў Еўропе. На Беларусі як натуралізаваны трапляецца Ж. мяцёлчаты (S. scoparius). Расце пераважна ў зах. і цэнтр. ч. рэспублікі ў сухіх хвойніках, у хваёва-дубовых лясах, радзей у ельніках, уздоўж дарог на ўзлесках. Здаўна вырошчваюць на ўзлесках і палянах для падкормкі дзікіх жывёл. Выкарыстоўваецца ў зялёным будаўніцтве.

Куст выш. 30—100 см, з разгалістымі, яркa-зялёнымі, прутkападобнымі, амаль бязліс-

тымі галінкамі. Лісце трайчастае, чаранковае, у верхняй ч. сцябла рэдукаванае. Кветкі буйныя, залаціста-жоўтыя, на доўгіх кветаножках, па адной у пазухах лісця, у сукупнасці ўтвараюць гронкападобныя суквецці. Медонос. Плод — падоўжана-лінейны струк. Размнажаецца насеннем і дзяленнем куста. Засухаўстойлівы. У суровыя зімы абмярзае.

ЖАРО́МСКІ (Żeromski) Стэфан (14.10.1864, Страўчын, Келецкае ваяв., Польшча — 20.11.1925), польскі пісьменнік. Працаваў хатнім настаўнікам, у 1892—1904 бібліятэкарам у Польскім музеі ў Раперсвілі і ў б-цы Замойскіх у Варшаве. У 1909—12 у эміграцыі ў Парыжы. Ужо для першых яго твораў характэрна сац. скіраванасць, зварот да тэмы нац.-вызв. руху (зб-кі «Апавяданні», «Раздзяўбуць нас крумкачы», абодва 1895). У цэнтры аўтабіягр. рамана «Сізіфава праца» (1897) пратэст супраць прымусовай русіфікацыі польскай школы. Раман «Бяздомныя» (т. 1—2, 1900) прысвечаны тэме духоўных пошукаў польскай інтэлігенцыі. Ідэя барацьбы за незалежнасць і трагічныя лёсы адданых

С.Жаромскі.

ёй барацьбітоў аб'ядноўвае раманы «Попел» (т. 1—4, 1904, экранізаваны 1965), «Прыгажосць жыцця» (1912), «Верная рака» (1912, пра паўстанне 1863) і трылогію «Барацьба з сатаной» (1916—19). Аўтар драм «Ружа» (1909) і «Сулкоўскі» (1910), раманаў «Гісторыя граху» (т. 1—2, 1908, экранізаваны 1933 і 1975), «Прадвесне» (1925). На бел. мову творы Ж. перакладаў М.Ф.Дубянецкі (зб. «Верная рака», 1985).

Тв.: Dzieła. T. 1—25. Warszawa, 1956—63; Рус. пер. — Избр. соч. Т. 1—4. М., 1957—58.

М.М.Хмяльніцкі.

ЖА́РСКІ Іван Міхайлавіч (н. 7.7.1944, в. Вярбіцы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. хімік-неарганік. Канд. хім. н. (1975), праф. (1990). Засл. работнік нар. адукацыі Беларусі (1994). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1971). З 1971 у Бел. тэхнал. ун-це (з 1987 рэктар). Навук. працы па электрахіміі, газавай электронаграфіі, мікрахвалевай спектраскапіі. Распрацаваў і ўкараніў тэхналогію ачышчэння прамысл. сцёкавых вод гальванічных вытв-сцей. Аўтар першага на бел. мове падручніка для вышэйшай школы «Асновы агульнай хіміі» (1995, з Г.І.Новікавым).

Тв.: Физические методы исследования в неорганической химии. М., 1988 (разам з Г.І.Новікавым).

ЖАРСТВА́, рыхлы матэрыял, складзены з вуглаватых абломкаў горных парод і мінералаў памерам 1—10 мм, утвораных пры выветрыванні пераважна магматычных парод. Гл. таксама *Абломкавыя горныя пароды.*

ЖАРТ, 1) кароткае апавяданне пра смешнае здарэнне, займальны выпадак; жанр *фальклору*. У параўнанні з *анекдотам*, які высмейвае і сац.-палітычныя з'явы, у Ж. звычайна пацяшаюцца з асобных рыс і якасцей людзей, бытавых здарэнняў. Вызначаецца аднаэпізадычнасцю, нечаканай іранічнай развязкай. Часта мае форму дыялога. 2) Кароткая (аднаактовая) камічная п'еса, звычайна бытавога характару («Прымакі» Я.Купалы, «Збянтэжаны Саўка» Л.Родзевіча і інш.).

Публ.: Народныя ўсмешкі. Мн., 1961; Беларускія народныя жарты. Мн., 1970; Жарты, анекдоты, гумарэскі. Мн., 1984. *А.С.Фядосік.*

ЖАРТА́Й, возера ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл., на пойме р. Прыпяць, за 26 км на ПдЗ ад г. Хойнікі. Пл. 0,24 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 250 м, даўж. берагавой лініі каля 4 км. Старычнае. Берагі месцамі выш. да 1 м, пясчаныя, пад хмызняком. Злучаецца з Прыпяццю ў час веснавога разводдзя.

ЖАРТА́ЙКА, рака ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Даўж. 20 км. Пл. вадазбору 86 км^2. Пачынаецца за 3 км на У ад в. Жартайка. Цячэ пераважна праз лес, у нізоўі — праз *Бярэзінскі біясферны запаведнік.*

ЖАРТО́ЎНЫЯ ПЕ́СНІ, разнавіднасць пазаабрадавай сац.-бытавой лірыкі вуснай нар. творчасці. У іх высмейваюцца адмоўныя з'явы ў сямейна-бытавым і грамадскім жыцці (лянота, нядбайнасць, прагнасць, п'янства, нявернасць, несумленнасць і інш.). Гал. персанажы — муж і жонка, дзед і баба, хлопец і дзяўчына. Ж.п. малююць канкрэтныя тыпы, падкрэсліваючы і перабольшваючы іх заганы, надаюць ім абагульненасць. Нярэдка ў песнях гучыць аўтаіронія, што сведчыць пра духоўнае здароўе народа (напр., песня «Чаму ж мне не пець»). Характарыстыка героя ўспрымаецца не як публічнае самавыкрыццё, што мяжуе з самапрыніжэннем, а як усведамленне правільнасці нар. ідэалу. Высмейванне адмоўных якасцей ставіла адну мэту — сцвердзіць дабро. Асобную групу складаюць т.зв. песні-небыліцы або небывальшчыны. У дзіцячым рэпертуары пашыраны Ж.п. алегарычнага зместу, іх персанажы — звяры, птушкі, насякомыя. Часам яны дыдактычныя. Шмат песень жартоўнага характару ў каляндарнай і сямейна-абрадавай паэзіі, але іх не вылучаюць у асобныя жанравыя групы.

Публ.: Жартоўныя песні. Мн., 1974.

Літ.: Гілевіч Н.С. Наша родная песня. Мн., 1968. С. 63—68; Фядосік А.С. Трапным народным словам. Мн., 1971. С. 150—169; Беларуская народнапаэтычная творчасць. Мн., 1979. С. 367—375. *І.К.Цішчанка.*

ЖАРУ́ШНІК (Rorippa), род кветкавых раслін сям. капуставых. Каля 70 відаў. Пашыраны ва ўмераных і трапічных абласцях зямнога шара. На Беларусі 6 відаў: найб. вядомыя Ж. балотны (R. palustris), земнаводны, або вадзяны хрэн (R. amphibia), і лясны (R. sylvestris); зрэдку трапляюцца Ж. аўстрыйскі (R. austriaca), кароткаплодны (R. brachycarpa) і распасцёрты (R. anceps). Растуць на вільготных лугах, балотах, па берагах рэк, азёр, канаў, у вадзе, як занесеныя — каля дарог.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны з разгалінаваным прамастойным ці прыўзнятым сцяблом. Лісце чаргаванае, суцэльнае або перыстарассечанае. Кветкі дробныя, жоўтыя, у густых гронках. Плод — стручок або стручочак. Лек., меданосныя, харч. і кармавыя расліны. Некаторыя віды ядавітыя.

Жарушнік земнаводны.

ЖА́РЫ, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Вілейка—Докшыцы. Цэнтр сельсавета. За 40 км на ПнУ ад г. Вілейка, 143 км ад Мінска, 15 км ад чыг. ст. Крывічы. 946 ж., 380 двароў (1997). Пачатковая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ЖА́РЫ, вёска ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 14 км на Пд ад г.п. Ушачы, 164 км ад Віцебска, 26 км ад чыг. ст. Лепель. 293 ж., 109 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму і сав. воінаў.

ЖА́РЫКАЎ Іван Сямёнавіч (н. 15.9.1921, в. Хацілавічы Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1976), праф. (1977). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыў Маскоўскую вет. акадэмію (1951). У 1957—91 у Бел. НДІ эксперым. ветэрынарыі імя Вышалескага (у 1968—88 дырэктар). Навук. працы па біял. асновах прафілактыкі паразітозаў с.-г. жывёл. Распрацаваў і ўкараніў у

вытворчасць меры барацьбы з трэматадозамі жвачных жывёл, рэкамендацыі па абеззаражванні гною з выкарыстаннем радыебіял. метадаў.

Тв.: Экономическая эффективность ветеринарных мероприятий. Мн., 1981 (у сааўт.); Справочник по болезням сельскохозяйственных животных. 2 изд. Мн., 1990 (у сааўт.); Лекарственные средства и биологические препараты в ветеринарии. Мн., 1993 (разам з А.Е.Антаненкам, С.С.Ліпніцкім).

ЖА́РЫН Генадзь Лаўрэнцьевіч (н. 7.6.1946, г. Гомель), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1974). Працуе пераважна ў манум. жывапісе: вітражы «Пераўтварэнне энергіі» (1976, з В.Даўгала) у чытальнай зале Дома культуры г. Новалукомль (Віцебская вобл.), «Хлеб Радзімы» (1982, з Ю.Багушэвічам) у фае Дома культуры саўгаса «Рагінь» Гомельская вобл., размалёўкі ў тэхніцы энкаўстыкі («Партызаны Міншчыны» і інш.) і плафон «Мінск — горад-герой» (1979—82, з Багушэвічам) у холе канферэнц-залы б. Мінскага гаркома КПБ. Аўтар станковых работ «Габеленшчыцы» (1979), «Слова пра родную зямлю» (1982) і інш.

ЖАРЭ́С (Jaurés) Жан Леон (3.9.1859, г. Кастр, Францыя — 31.7.1914), дзеяч франц. і міжнар. сацыяліст. руху, гісторык. Праф. філасофіі Тулузскага ун-та (1883—85). У 1885—89, 1893—98 і 1902—14 дэп. парламента. У рабочым руху і ў 2-м Інтэрнацыянале адстойваў рэфармісцкія погляды. У 1902 узначаліў Франц. сацыяліст. партыю, пасля яе аб'яднання (1905) з Сацыяліст. партыяй адзін з лідэраў правага крыла Аб'яднанай сацыяліст. партыі. У 1904 заснаваў газ. «L'Humanite» («Чалавецтва»). Выступаў супраць каланіялізму, мілітарызму і вайны. Забіты франц. фанатыкам-нацыяналістам Р.Віленам напярэдадні 1-й сусв. вайны. Аўтар твораў «Пачаткі сацыялізму ў Германіі Лютэра, Канта, Фіхтэ і Гегеля» (1891), «Сацыялістычныя даследаванні» (1901), «Новая армія» (1911), арганізатар і рэдактар калект. працы «Сацыялістычная гісторыя, 1789—1900» (т. 1—13, 1901—08), аўтар яе першых 4 тамоў, прысвечаных Франц. рэвалюцыі 1789—99.

ЖАСКЕ́Н ДЭПРЭ, Жаскін дэ Прэ (Josquin Desprez, Josquin des Pres; каля 1440, каля г. Сен-Кантэн, Францыя — 1521 або 1524), франка-фламандскі кампазітар; адзін з буйнейшых поліфаністаў эпохі Адраджэння. Быў царк. пеўчым, у т.л. саборнай капэлы ў Мілане, папскай капэлы ў Рыме (1486—99); прыдворным музыкантам Людовіка XII. У апошнія гады жыцця настаяцель сабора ў Кандэ-сюр-л'Эско. Прадстаўнік *нідэрландскай школы*, ён абагульніў яе дасягненні, садзейнічаў спрашчэнню поліфанічнага стылю шляхам вызвалення муз. тканіны ад кантрапунктычнай ускладненасці. Аўтар мес, матэтаў, свецкіх песень, інстр. п'ес і інш. У Амстэрдаме выдадзены Поўны збор яго твораў у 12 тамах (1921—69).

ЖАСЦЁР (Rhamnus), род кветкавых раслін сям. крушынавых. Больш за 140 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Афрыцы і Паўн. Амерыцы. На Беларусі 1 дзікарослы барэальны еўрапейскі від — Ж. слабіцельны (Rh. cathartica), расце на схілах рачных тэрас, у лясах, сярод хмызнякоў, і 18 інтрадукаваных: Ж. фарбавальны (Rh. tinctoria), Ж. вальховаліcты (Rh. alnifolia), Ж. дыяментавы (Rh. diamantiaca), Ж. усурыйскі (Rh. ussuriensis) і інш.

Кусты і невял. дрэвы, часта з калючымі галінкамі і пупышкамі, укрытымі лускавінкамі. Лісце супраціўнае, шчыльнае, яйцападобнае з травяністымі прылісткамі. Кветкі малапрыкметныя, жаўтавата-зялёныя вузказваночкавыя. Плод — сакаўная касцянка. Лек., дэкар., фарбавальныя, дубільныя расліны, меданосы. Выкарыстоўваюцца ў азеляненні.

Жасцёр слабіцельны.

ЖАСЦІ́НАЕ, вёска ў Акалоўскім с/с Лагойскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 39 км на Пн ад Лагойска, 79 км ад Мінска, 60 км ад чыг. ст. Смалявічы. 330 ж., 114 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ЖАЎНА́, дзяцел чорны (Dryocopus martius), птушка сям. *дзятлавых*. Пашырана ў старых высакаствольх хва-

Жаўна: 1 — самка; 2 — самец.

ёвых і мяшаных лясах Еўразіі. На Беларусі нешматлікі аселы від, трапляецца ўсюды. Нар. назвы жолна, чорная жолна.

Даўж. цела да 50 см, маса да 360 г. Ад інш. дзятлаў адрозніваецца буйнымі памерамі і чорнай афарбоўкай (адсюль другая назва). Апярэнне з метал. бляскам на спіне. У самца на цемі і патыліцы, у самак на патыліцы кармінава-чырв. або малінава-чырв. «шапачка». Гнёзды ў дуплах дрэў, якія сама выдзёўбае. Нясе 3—6 яец. Корміцца насякомымі і іх лічынкамі, якія водзяцца пад карой і ў драўніне (мурашкі-шашалі, караеды, вусачы і інш.).

ЖАЎНЯ́К Расціслаў Міхайлавіч (н. 6.10.1939, в. Валокі Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. матэматык. Канд. фізіка-матэм. н. (1972), праф. (1993). Скончыў БДУ (1964). З 1969 ў Ін-це матэматыкі АН Беларусі, з 1972 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па тэорыі аптымальнага кіравання дынамічнымі сістэмамі. Аўтар падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Высшая математика. Мн., 1993 (разам з А.А.Карпуком).

Ж.Жарэс.

А.Жаўрук.

ЖАЎРУ́К Алесь (сапр. Сінічкін Аляксандр Дзмітрыевіч; 19.8.1910, г. Сянно Віцебскай вобл. — 23.8.1942), бел. паэт. Скончыў Маскоўскі ін-т гісторыі, філасофіі і л-ры (1938). Загінуў у баях пад Сталінградам. Друкаваўся з 1926. У зб-ках «Ручаіны» (1936), «Дняпро выходзіць з берагоў» (1938) аптымістычны пафас, рамантыка прац. будняў, эстэтычная завершанасць. Апяваў гераіку грамадз. вайны, рэв. подзвіг («Чапаеў», «Рагачоўскі сшытак», «Песня пра дукорскіх партызан»). Паэма «Крывёю сэрца» (1938) пра барацьбу з фашызмам у Іспаніі. З А.Ушаковым напісаў для дзяцей паэмы «Пра майго таварыша», «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада» (абедзве 1939), лібрэта аперэты «Зарэчны барок».

Тв.: Выбранае. Мн., 1960; У кн.: Крывёю сэрца. Мн., 1987.

ЖАЎРЫД Павел Якаўлевіч (13.6.1899, в. Цецяроўка Слуцкага пав. Мінскай губ. — 14.5.1939), дзеяч бел. нац. руху. Скончыў Слуцкую гімназію (1909), вучыўся ў Варшаўскім ун-це. З 1916 у арміі. Дэлегат Усебел. з'езда 1917. Летам 1919 арыштаваны Надзвычайнай камісіяй «па абвінавачанні ў дапамозе Дзяні-

кіну». У ліст. вызвалены, абраны старшынёй Бел. нац. к-та ў Слуцку. З лета 1920 у Чырв. Арміі, пам. камандзіра Слуцкай кав. роты. У канцы 1920 Найвышэйшай радай БНР прызначаны камісарам Случчыны, уваходзіў у Бел. раду Случчыны. Адзін з кіраўнікоў *Слуцкага паўстання 1920.* З 1921 у Вільні ў Бел. нац. к-це, Бел. школьнай радзе. У 1923—30 працаваў у Белсельпрамсаюзе, Мар'інагорскім с.-г. тэхнікуме, Інбелкульце, газ. «Звязда». 18.7.1930 арыштаваны па справе «Саюза вызвалення Беларусі», 10.4.1931 асуджаны на 3 гады папраўча-працоўных лагераў (ППЛ). У 1933—37 жыў у ссылцы ў г. Сарапул Удмурцкай АССР. У 1937 асуджаны на 10 гадоў ППЛ, дзе і памёр. Рэабілітаваны ў 1988. *У.М.Міхнюк.*

ЖАЎРЫД Эдвард Антонавіч (н. 8.10.1939, г. Слуцк Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне анкалогіі. Д-р мед. н. (1988), праф. (1992). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1962). З 1964 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, з 1966 у Бел. НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі (з 1978 заг. аддзялення хіміяпрамянёвай тэрапіі). Навук. працы па камбінаваным лячэнні злаякасных пухлін з выкарыстаннем гіпертэрміі і гіперглікеміі, мадыфікацыі хімія- і радыеадчувальнасці злаякасных пухлін з дапамогай фізіка-хім. уздзеянняў, фотадынамічнай тэрапіі, пошуку і апрабацыі новых супрацьпухлінных прэпаратаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1988.

Тв.: Применение гипертермии и гипергликемии в комплексном лечении злокачественных новообразований. М., 1981 (у сааўт.); Гипертермия и гипергликемия в онкологии. Киев, 1987 (разам з С.П.Асінскім, С.З.Фрадкіным); Диагностика и лечение распространенного рака желудка. Мн., 1991 (разам з М.Я.Фішарам, Н.У.Сачыўка).

Жаўтабрухі полаз.

ЖАЎТАБРЎХІ ПО́ЛАЗ, жаўтабрух (Coluber jugularis), змяя сям. *вужовых.* Пашыраны ў Паўд. Еўропе, у Пярэдняй і М. Азіі. Жыве ў адкрытых стэпах, паўпустынях, кустовых зараснікаў і інш.

Даўж. да 2,5 м. Верхні бок цела ўсіх адценняў аліўкавага колеру, без узору. Бруха жоўтае, палевае, зрэдку чырванаватае. Вакол вачэй звычайна жоўтая пляма. Адкладвае 6—16 яец. Корміцца дробнымі млекакормячымі, паўзунамі, птушкамі, насякомымі. Агрэсіўны, нападае нават на чалавека. Укус дарослага Ж.п. балючы і кроватачывы, але не небяспечны.

ЖАЎТАЗЕ́ЛЬ (Genista), род кветкавых раслін сям. бабовых. Больш за 70 відаў. Пашыраны пераважна ў Міжземнамор'і. На Беларусі ў паўд. ч. трапляецца Ж. фарбавальны (G. tinctoria), расце падлескам у хваёвых, бярозава-хваёвых і бярозавых лясах, і Ж. германскі (G. germanica, нар. назва колкая трава), рэдкі цэнтр.-еўрапейскі горны від, расце ў хваёва-дубовых і шыракалістых лясах, сярод хмызняку, на ўзлесках і палянах. Занесены ў Чырв. кнігу Рэспублікі Беларусь.

Кусты і паўкусты выш. да 0,6—1,5 м, з прамастойнымі, пруткападобнымі, злёгку рабрыстымі сцябламі, звычайна голымі, іншы раз апушанымі белымі валаскамі, унізе з калючкамі. Лісце простае, эліпсоіднае, з кароткім вострым канцом, голае, бліскучае або злёгку валасістае. Кветкі жоўтыя, у шматлікіх гронках на канцах галінак. Плод — струк. Лек. (мачагонны, жаўцягонны, слабіцельны, абязбольваючы сродак), фарбавальная расліна.

Жаўтазель фарбавальны.

ЖАЎТАЗЁМЫ, глебы, якія фарміруюцца пад шыракалістымі лясамі ва ўмовах вільготных субтропікаў. Пашыраны ў Кітаі, на Пд ЗША, ПдУ Аўстраліі і ў Новай Зеландыі, у Грузіі і Азербайджане. Маюць 5—10% гумусу. Жоўтая афарбоўка абумоўлена малой колькасцю жалеза ў мацярынскіх пародах і моцным увільгатненнем, якое выклікае гідратацыю вокіслаў жалеза ў глебе. Асн. тыпы: жаўтазёмы, падзоліста-жаўтазёмападобныя, жаўтазёмна-глеевыя, падзоліста-жаўтазёмна-глеевыя. На Ж. вырошчваюць чай, цытрусавыя, вінаград, тытунь, эфіраалейныя культуры.

ЖАЎТАКРЎГ (Jrommsdorfie), род кветкавых раслін сям. астравых. 20 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўд. Амерыцы. На Беларусі трапляецца Ж. рабы (J. maculata) у хваёвых лясах, на палянах і ўзлесках.

Шматгадовыя травяністыя расліны выш. 50—100 см, з тоўстым вертыкальным коранем, шурпата-валасістым прамым сцяблом і разеткай прадаўгаватых лістоў з характэрнай чырвонай жылкай. Кветкі залаціста-жоўтыя, язычковыя, духмяныя, у кошыках, размешчаных па 1—4 на верхавінках сцёблаў. Плод — сямянка, з чубком з перыстых валаскоў. Лек. (слабіцельны, змякчальны, процізапаленчы, антысептычны сродак) і кармавая расліна.

ЖАЎТАЛО́З, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Вярба.*

ЖАЎТАПЎЗІК, глушэц (Ophisaurus apodus), яшчарка сям. вераценніцавых. Пашыраны ў Паўд.-Зах. Еўропе, Сярэдняй і Паўд.-Зах. Азіі. Жыве пераважна ў сухіх месцах, з густой расліннасцю.

Даўж. да 1,5 м, маса да 550 г. Верхняя ч. цела бурая, брудна-бурая з аліўкавым або чырванавата-бурым адценнем, ніжняя — жоўта-бурая або мясного колеру. Цела змеепадобнае, без ног (у самцоў захаваліся рудыменты задніх ног). Пад луской залягаюць касцявыя пласцінкі (астэадэрмы). Па баках цела глыбокая маршчына скуры, высланая дробнай луской. Адкладваюць 8—10 яец. Кормяцца беспазваночнымі (пераважна насякомымі і малюскамі), дробнымі пазваночнымі.

Жаўтапузік.

ЖАЎТО́К, пажыўныя рэчывы, якія назапашваюцца ў яйцаклетках жывёл і чалавека ў выглядзе гранул (радзей суцэльнай масы) і служаць для жыўлення зародка на працягу яго развіцця. Мае ў сабе бялкі, тлушчы, вугляводы, рыбануклеінавую кіслату, мінер. рэчывы; асн. яго масу складаюць ліпа- і глікапратэіды. Наяўнасць Ж. ў яйцаклетках абумоўлівае іх значна большыя памеры ў параўнанні са сперматазоідамі. Сінтэз Ж. бывае энда- або экзагенным у залежнасці ад таго, дзе ён ажыццяўляецца: у яйцаклетцы або па-за ёй.

ЖАЎТУ́ХА, жаўтушная афарбоўка склераў, скуры, слізістых абалонак; сіндром захворванняў з парушэннем білірубінавага абмену. Назіраецца пры хваробах

Жаўтакруг рабы.

печані (гл. *Гепатыт інфекцыйны*), жоўцевых шляхоў (гл. *Жоўцекамянёвая хвароба* і інш. механічныя Ж.), крыві (гл. *Гемалітычная хвароба нованароджаных* і інш. гемалітычныя Ж.), пры некат. фізіял. станах, ад павышанага назапашвання ў крыві і ў тканках жоўцевага пігменту — білірубіну. Жаўтуха нованароджаных — жаўтушная афарбоўка скуры і слізістых абалонак у дзяцей да 4—5 тыдняў жыцця. Бывае ад парушэння звязвання білірубіну (фізіял. Ж.н.), ад узмоцненага распаду — гемолізу эрытрацытаў (гемалітычная хвароба нованароджаных), ад мех. затрымкі жоўці (прыроджанае недаразвіццё ці набытае звужэнне жоўцевывадных шляхоў), ад пашкоджання тканак печані. Лячэнне: выдаленне білірубіну з арганізма. *А.А.Астапаў.*

ЖАЎТУ́ХА РАСЛІ́Н, хваробы, якія выклікаюцца пераважна мікаплазмападобнымі арганізмамі і вірусамі. Пашкоджвае бульбу, канюшыну, цыбулю, моркву, дэкар. культуры і інш. Пашырана ўсюды. Хворыя расліны характарызуюцца карлікавасцю, хларозам і пажаўценнем лісця, шматлікімі бакавымі парасткамі, якія прыціснуты да гал. сцябла; у кветках падоўжаныя чашалісцікі з пазелянелымі дэфармаванымі венчыкамі, завязь прарастае ў лісцікі. Рэзерватары віруса — пустазелле (дзьмухавец, асот палявы, шчаўе, рамонкі, трыпутнік і інш.). Узбуджальнік перадаецца насякомымі-пераносчыкамі (пераважна цыкадамі і тлямі). Пра меры барацьбы гл. ў арт. *Вірусныя хваробы раслін.*

ЖАЎТУ́ШКІ (Colias), род дзённых матылёў сям. бялянак. Каля 30 відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. Жывуць пераважна ў высакагор'ях і ў арктычнай зоне. Некат. трапляюцца на раўнінах: у стэпах, на балотах, лугах, у лясах і інш. На Беларусі 4 віды Ж.: малая, ці лугавая (C. hyale), шафранавая (C. croceus), зяноўцавая (C. myrmidone), тарфянікавая (C. palaeno; занесена ў Чырв. кнігу).



Жаўтушкі: 1 — шафранавая; 2 — лугавая; 3 — тарфянікавая (*а* — самец; *б* — самка).

Крылы (размах да 6 см) чырвоныя, аранжавыя, жоўтыя, зеленаватыя, часта з чорным абадком на вонкавым краі. Ніз задніх крылаў жоўты. Выразны палавы дымарфізм або полімарфізм: крылы ў самак святлейшыя, чым у самцоў (звычайна зеленаватыя або белыя). Вусікі кароткія, з прытупленай булавой. Вусені развіваюцца пераважна на бабовых раслінах.

ЖАЎТУ́ШНІК (Erysimum), род кветкавых раслін сям. капуставых. Больш за 100 відаў. Пашыраны ва ўмераных абласцях Еўропы, Азіі і Паўн. Афрыкі, пераважна ў Міжземнамор'і. На Беларусі 5 відаў: Ж. выгрызены (E.repandum), лакфіёлевы (E. cheiranthoides), раскідзісты (E. diffusum), цвёрды (E. durum) і яструбковалісты (E. hieracifolium). Растуць на лугах, травяных схілах, у ярах, як пустазелле на палях і агародах, таксама як занесеныя каля дарог.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны з разгалінаваным прамастойным сцяблом. Лісце чаргаванае, суцэльнае, пераважна падоўжана-ланцэтнае. Кветкі дробныя, жоўтыя, рэдка ліловыя або белыя, у густых

Жаўтушнік раскідзісты.

гронках. Плод — стручок. Лек., меданосныя і дэкар. расліны. Некаторыя віды ядавітыя. *Г.У.Вынаеў.*

ЖАЎЦЯГО́ННЫЯ СРО́ДКІ, рэчывы, якія стымулююць утварэнне жоўці або павялічваюць выдзяленне яе ў дванаццаціперсную кішку.

Падзяляюць на 3 групы: прэпараты, у якіх ёсць жоўць і жоўцевыя к-ты (алахол, дыгідрахолевая к-та, халензім і інш.), сінт. рэчывы (оксафенамід, нікадзін і інш.), лек. настоі, экстракты, канцэнтраты, якія атрымліваюць з кветак бяссмертніку пясчанага, рыльцаў кукурузы, вял. падтынніку, амурскага барбарысу і інш. Ж.с. ўжываюць пры хваробах печані, жоўцевага пузыра і жоўцевывадных шляхоў (гепатыт, *халецыстыт*, *жоўцекамянёвая хвароба*, халангіт і інш.).

ЖАХО́ЎСКІ Цыпрыян (Кіпрыян, каля 1635, Полацкае ваяв. — кастр. 1693), уніяцкі царк. дзеяч Рэчы Паспалітай. Д-р тэалогіі. Вучыўся ў Грэчаскім калегіуме ў Рыме (1658—64). Архімандрыт шэрагу манастыроў, у 1671—74 каад'ютар (памочнік-намеснік) пры мітрапаліце Г.Календзе. Мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсяе Русі (1674—93), адначасова архіепіскап полацкі. Для пашырэння уніі выкарыстоўваў адм. сродкі. Удзельнік склікання ў 1680 у Любліне з'езда уніятаў і праваслаўных, які апісаў у кнізе «Люблінскі калёквіум...» (Замосце, 1680, на польскай мове). Імкнуўся абмежаваць у царкве ўплыў *базыльян*, што выклікала з імі канфлікт. У пач. 1690-х г. заснаваў Супрасльскую друкарню. Ахвяраваў сродкі на рамонт храмаў у Вільні, Навагрудку, Полацку. *С.В.Казуля.*

ЖА́ЦЕРАЎКА, Зацяржуўка, рака ў Карэліцкім р-не Гродзенскай вобл. і Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. Нёман. Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 91 км^2. Пачынаецца каля в. Азёрскае Карэліцкага р-на, на ўсім працягу каналізаваная. Створана сажалка.

ЖАШУ́Й, Эдзін-Гол (у вярхоўі — Хэйхэ), рака на Пн Кітая. Даўж. каля 900 км. Вытокі ў ледавіках хрыбтоў Ціляньшань і Таалайшань (горы Наньшань), цячэ праз пустыні Алашань і Гобі, упадае некалькімі рукавамі (гал. — Марын-Гол, Іх-Гол) у азёры Гашун-Нур і Саго-Нур. Летняя паводка. Выкарыстоўваецца на арашэнне.

ЖБА́НАЎ Уладзімір Іванавіч (н. 26.1.1954, Мінск), бел. скульптар. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1979). Выкладае ў Мінскім маст. вучылішчы (з 1985). Працуе ў манум. і станковай скульптуры, дробнай пластыцы. Сярод твораў: помнік Герою Сав. Саюза А.Мірапенку (1981), помнік воінам-інтэрнацыяналістам у г. Светлагорск Гомельскай вобл. (1991, з А.Каструковым), бюсты Ю.Гагарына (1989), М.Горкага (1986), кампазіцыі «Жаночы эцюд» (1985), «Экзамен» (1988), «Галгофа» (1991), «Грацыя» (1994), «Восеньскі пацалунак» (1996), «Манекеншчыцы» (1997), рэльеф «Анёлы» (1990), партрэты актрысы Юр'евай (1974), акцёра А.Кляшторнага (1992), бацькі (1995) і інш. *Г.А.Фатыхава.*

ЖБАНКО́ВА Інеса Іванаўна (н. 7.3.1933, г. Полацк), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1978), праф. (1982). Скончыла БДУ (1955). У 1955—79 працавала ў Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. З 1979 у БДУ (у 1979—87 заг. кафедры філасофіі, з 1992 — сацыялогіі). Даследуе філас. праблемы прыродазнаўства, тэорыі і метадалогіі навукі, сацыялогіі.

Тв.: О развитии в неорганической природе. Мн., 1964; Проблема взаимодействия. Мн., 1971; Философские принципы в научном познании. Мн., 1974; Социальное действие. Мн., 1980 (у сааўт.).

ЖБАНКО́Ў Расціслаў Георгіевіч (н. 30.10.1930, г. Рагачоў Гомельскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1972), праф. (1974). Скончыў БДУ (1954). З 1959 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па спектраскапіі вугляводаў, бялкоў, прыродных і сінт. палімераў. Даследаваў і сістэматызаваў спектральныя характарыстыкі асн. стэрэаізамерных форм вугляводаў, выя-

віў асн. тыпы канфармацыі монацукрыдаў і іх палімераў, распрацаваў комплекс спектраскапічных метадаў тонкага структурнага аналізу розных відаў палімераў.

Тв.: Физика целлюлозы и ее производных. Мн., 1983 (разам з П.В.Казловым); Внутри- и межмолекулярные взаимодействия в углеводах. Мн., 1988 (разам з В.П.Пановым).

ЖВА́ЧКА, перажоўванне корму, перыядычна адрыгнутага з пач. аддзелаў мнагакамернага страўніка *жвачных* жывёл. Уяўляе сабой біял. прыстасаванне, пры дапамозе якога жвачныя жывёлы могуць лепш, чым інш. траваедныя, ператраўліваць пажыўныя рэчывы грубых кармоў. Адбываецца рэфлекторна ў прамежках паміж кармленнем. Корм невял. порцыямі адрыгваецца з *рубца* і сеткі ў ротавую поласць, дзе перажоўваецца, увільгатняецца слінай і зноў заглынаецца; праз пэўны час цыкл паўтараецца. Паяўляецца ў жывёл з 3-га тыдня і стабілізуецца к 8—10 месяцам. У дарослых жывёл за суткі адбываецца 6—10 жвачных перыядаў.

ЖВА́ЧНЫЯ (Ruminantia), падатрад млекакормячых атр. *парнакапытных*. 5—6 сям., 76 родаў, каля 180 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Аўстраліі, Мадагаскара і Антыльскіх а-воў. Пераважна стадныя палігамныя жывёлы. На Беларусі 5 відаў: *алень высакародны*, *зубр*, *казуля*, *лань*, *лось*. Зубр занесены ў Чырв. кнігу. Да Ж. належаць свойская жывёла: авечкі, козы, буйн. раг. жывёла.

Маюць 4 пальцы (2 з іх рудыментарныя). У страўніку 4 аддзелы — рубец, сетка, кніжка (у некат. няма) і сычуг. Корм раслінны. Вял. значэнне для Ж. мае *жвачка* (адсюль назва). Карэнныя зубы вял., разцы і іклы толькі ў ніжняй сківіцы. У многіх добра развітыя рогі. Дзікія Ж. — аб'екты промыслу.

ЖВІР, г р а в і й, рыхлая буйнаабломкавая (псефітавая) асадкавая парода, складзеная з абкатаных абломкаў горных парод і мінералаў памерамі 1—10 мм (у горнай справе вылучаюць Ж. памерамі 5—70 мм). Адрозніваюць Ж. буйны (5—10 мм), сярэдні (2,5—5 мм) і дробны (1—2,5 мм). Генетычныя тыпы Ж.: рачны (гл. *Алювій*), азёрны, марскі і ледавіковы. Сцэментаваны Ж. — *гравеліт*. Якасць Ж. залежыць ад наяўнасці шкодных прымесей (акатышы глін, пыл, пірыт, гіпс, растваральныя ў шчолачах абломкі і інш.), трываласці, сціральнасці, марозаўстойлівасці і г.д. На Беларусі пясчана-жвірова-галечны матэрыял пашыраны ў антрапагенавых адкладах і сканцэнтраваны пераважна ў межах Беларускай грады і Паазер'я. Разведана 136 радовішчаў пясчана-жвіровых матэрыялаў з агульнымі запасамі 704,4 млн. м^3, з іх распрацоўваюцца 82 радовішчы з гадавой здабычай 23—24 млн. м^3. Форма пакладаў лінзападобная, зрэдку пластавая. Здабываецца Ж. адкрытым спосабам; частка яго абагачаецца на драбільна-сартавальных заводах. Выкарыстоўваецца для вытв-сці бетону, буд-ва чыгунак, аўтадарог, фільтрацыйных пабудоў і інш. *У.Я.Бардон.*

ЖГІРО́Ў Пілін Ерафеевіч (н. 24.11.1911, в. Гута Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944), ген.-маёр (1959). Скончыў вучэбна-каап. камбінат (Бабруйск), Маскоўскае ваен.-пях. вучылішча (1939), ваен. акадэміі імя Фрунзе (1947), Генштаба (1955). У Чырв. Арміі з 1933. Удзельнік баёў на р. Халхін-Гол у 1939. У Вял. Айч. вайну на Сталінградскім, Данскім, Бранскім, Цэнтр. і 1-м Бел. франтах. Нач. штаба стралк. палка маёр Ж. вызначыўся ў 1943 пры вызваленні Камарынскага р-на Гомельскай вобл. Да 1963 у Сав. Арміі.

ЖГУНЬ, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і племзавода «Жгунскі». За 8 км на Пд ад горада і чыг. ст. Добруш, 36 км ад Гомеля. 1200 ж., 486 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызана.

ЖГУТАНО́ГІЯ (Pedipalpi), група павукападобных. 3 атр.: тэліфоны (Uropygi), тартарыды, або схізапельтыдыі (Taptarides, або Schizopeltidia), фрыны (Amblypygi). 31 род, каля 150 відаў. Пашыраны ў вільготных трапічных лясах. Жывуць пад паваленымі дрэвамі, камянямі, у мурашніках і інш.

Даўж. да 75 мм. Цела цвёрдае, цёмнае, чырванаватае або жаўтаватае. Ногі доўгія, лапкі з 2 кіпцюркамі або прысоскамі. Пярэднія ногі даўжэйшыя за астатнія, выцягнутыя ў жгуты (адсюль назва) без кіпцюркоў, выконваюць ролю вусікаў. Лёгкіх 2 пары. Рыюць норкі даўж. да 0,5 м. У многіх ёсць анальныя залозы, якія выдзяляюць едкі сакрэт для абароны. Начныя драпежнікі. Кормяцца насякомымі, мнаганожкамі, чарвямі, слізнякамі.

ЖГУ́ЦІКАВЫЯ, ж г у ц і к а н о с ц ы (Mastigophora), падтып прасцейшых тыпу саркамастыгафор, па інш. сістэме — кл. тыпу прасцейшых, якія маюць *жгуцікі*. 2 кл. (падкл.) — раслінныя Ж., або фітамастыгіны (Phytomastigina), і жывёльныя Ж., або зоамастыгіны (Zoomastigina). 13 атр., каля 8 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў прэсных, таксама ў марскіх водах і часткова ў глебе. Ёсць паразіты жывёл і чалавека. Найб. вядомыя Ж.: *апаліны*, *лейшманіі*, *лямбліі*, *трыпанасомы*, *трыхаманады*, *эўгленавыя водарасці*, вальвоксы, хламідаманады.



Жгуцікавыя. Раслінныя: 1 — эўдарына зграбная; 2 — панцырны; 3 — хламідаманада. Жывёльныя: 4 — каўнерыкавы; 5 — мастыгамёба; 6 — спіратрыханімфа.

Даўж. цела ад 2—5 мікраметраў (лейшманіі) да 1 мм (некат. апаліны). Форма цела верацёна-, яйца-, шарападобная, цыліндрычная і інш. Цела ўкрыта *пелікулай*, хіцінападобным панцырам ці абалонкай з клятчаткавых пласцінак. Жгуцікаў ад 1—8 (на пярэднім канцы) да некалькіх тысяч (на ўсім целе); даўж. іх ад некалькіх да дзесяткаў мікраметраў. Клетачнае ядро пераважна адно, ёсць двух- (лямбліі) і мнагаядзерныя (апаліны). Некат. ўтвараюць калоніі (вальвокс). Размнажэнне ў асн. бясполае (падоўжаным дзяленнем папалам). Палавы працэс па тыпу *капуляцыі* гамет. Паводле спосабу кармлення — *аўтатрофы*, *гетэратрофы*, *міксатрофы*. Удзельнічаюць у кругавароце рэчываў у прыродзе, працэсах самаачышчэння вады. Індыкатары забруджвання вод. Некат. выклікаюць хваробы (напр., *лейшманіёз*, *лямбліёз*, сонную хваробу).

ЖГУ́ЦІКІ, ніткападобныя рухомыя цытаплазматычныя вырасты цела ў *жгуцікавых*, многіх бактэрый, зааспор, сперматазоідаў раслін і жывёл. Служаць пераважна для перамяшчэння ў вадкім асяроддзі. У клетцы бывае 1—4 (зрэдку больш) Ж. Структура Ж. складаная: звонку тонкая мембрана (*пелікула*), за ўнутр. поласці цытаплазма. Падоўжная вось складаецца з 2 цэнтр. і 9 перыферычных (простых або падвойных) вельмі тонкіх ніцей (фібрыл). У аснове Ж. — 2 перпендыкулярныя базальныя цельцы. Рухаюцца пераважна хваленадобна. Знаходзяцца з аднаго, абодвух бакоў або па ўсёй паверхні клеткі.

ЖДАН Алег (сапр. П у ш к і н Алег Аляксеевіч; н. 5.1.1938, г. Смаленск, Расія), бел. пісьменнік. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1960), Літ. ін-т імя М.Горкага (1969), Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве (1978). Працаваў на Бел. тэлебачанні, кінастудыі «Беларусьфільм». З 1993 у час. «Нёман». Друкуецца з 1963. Піша на рус. мове. Асн. тэмы: жыццё гараджаніна ў першым пакаленні, побыт людзей правінцыяльных гарадоў Беларусі (кн. прозы «У час развітання», 1975, «У гасцях і дома», «Знаёмы», абедзве 1977, «Рысы і абліччы», 1985, «Па абодва бакі прахадной», 1987, «Самастойнае жыццё», 1990). Аўтар сцэнарыяў фільмаў «Сумленны, разумны, нежанаты» і «Хочаце любіце, хочаце не», п'есы «Салгалі Богу, салгалі» (1993). Перакладае на рус. мову творы бел. пісьменнікаў.

ЖДАН Віктар Іванавіч (20.2.1918, г. Тайга Кемераўскай вобл., Расія — 16.7.1978), бел. графік. Скончыў Віцебскае маст. вучылішча (1937). Працаваў у карыкатуры, кніжнай графіцы, стварыў шэраг партрэтаў, серыі лістоў на спарт.

тэму. Аўтар франтавых малюнкаў і плакатаў (1942—45), серый «Сябры-аднапалчане» (1944—45), «Беларусь спартыўная» (1960), графічных лістоў «Наступленне» (1947), «Малады токар» (1958), а таксама жывапісных работ «Кнігі і час» (1966), «Салдацкая сіла» (1968) і інш.

ЖДАН Яўген Іванавіч (н. 15.12.1937, в. Тарэйкі Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), бел. мастак. Засл. работнік культуры Беларусі (1982). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1967). Працаваў у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі, Рэсп. дырэкцыі эстрадна-цыркавога мастацтва (гал. мастак з 1987), з 1994 гал. мастак Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі. Афарміў спектаклі: у т-ры оперы і балета — «Пасля балю» Г.Вагнера (1971), «Іаланта» П.Чайкоўскага (1975), «Рыгалета» Дж.Вердзі (1982); у т-ры муз. камедыі — «Паненка і хуліган» на музыку Дз.Шастаковіча (1982), «Капялюш Напалеона» О.Штрауса (1996), «Цыганскі барон» І.Штрауса (1997); у т-ры оперы і балета ў Ніжнім Ноўгарадзе (Расія) — «Аіда» Вердзі (1978), «Дэман» А.Рубінштэйна (1979) і інш. Працуе таксама ў жывапісе: цыклы «Жыціе беларускіх святых» (1989—94), «Жыццё славянскіх асветнікаў-гуманістаў» (1991), станковыя работы «Чарнобыль» (1987—93), «Апафеоз Ф.Скарыны» (1990), «Гімн жыццю» (1997), пейзажы «Песня маёй радзімы», «Вясна. Сноў» (абодва 1990-я г.). Сярод графічных работ «Кожны чацвёрты» (1967), «Курапаты» (1986). У творчасці рэаліст. вобразнасць спалучае з сімволікай і метафарычнасцю, некаторым работам уласцівы класічны авангард з філасофскім кірункам. Іл. гл. таксама да арт. *Афармленчае мастацтва.*

Літ.: Фатыхава Г. Яўген Ждан. Мн, 1997. *Г.А.Фатыхава*

ЖДА́НАЎ Андрэй Аляксандравіч (26.2.1896, г. Марыупаль, Украіна — 31.8.1948), савецкі дзярж. і парт. дзеяч. Удзельнік рэв. руху з 1912, чл. Цвярскога к-та РСДРП(б) з 1916. У 1917 на вайск. службе, вёў рэв. прапаганду сярод салдат. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. палкавога к-та, старшыня Шадрынскага к-та РСДРП(б). У 1918—20 на паліт. рабоце ў Чырв. Арміі на Урале і ў Цверы, рэдактар газ. «Тверская правда». З 1922 на сав. і парт. рабоце. У 1934—48 сакратар ЦК, адначасова ў 1934—44 1-ы сакратар Ленінградскага абкома і гаркома ВКП(б). У Вял. Айч. вайну чл. Ваен. савета Ленінградскага фронту, генерал-палкоўнік (1944). Адна з прыбліжаных да І.В.Сталіна асоб.

ЖДА́НАЎ Леанід Афанасьевіч (29.4.1890, пас. Махінджауры, Аджарыя, Грузія — 27.12.1974), вучоны-селекцыянер, акад. УАСГНІЛ (1948), Герой Сац. Працы (1965). Скончыў Маскоўскі ун-т (1914) і Маскоўскі с.-г. ін-т (1917). З 1924 кансультант і кіраўнік групы селекцыі сланечніку на Данской доследна-селекцыйнай станцыі Усесаюзнага НДІ алейных культур, адначасова ў 1946—50 заг. аддзела генетыкі і селекцыі Біял. ін-та Растоўскага ун-та. Навук. працы па селекцыі сланечніку, аўтар высокаўраджайных заразіхаўстойлівых сартоў алейных культур. Дзярж. прэмія СССР 1941.

ЖДА́НАЎ Мікалай Мікалаевіч (1.10.1902, г.п. Алавяная Чыцінскай вобл., Расія — 21.4.1966), ваенны дзеяч, ген.-палк. артылерыі (1955). Беларус. Канд. ваен. н. Скончыў Артыл. акадэмію (1937). У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны. З 1938 выкладчык, нач. кафедры ваен. акадэміі. У Вял. Айч. вайну на Ленінградскім фронце: камандзір палка, нач. штаба артылерыі арміі, фронту, камандуючы артылерыяй арміі, камандзір артыл. корпуса. З 1944 на выкладчыцкай рабоце ў ваен. акадэміі. У 1955—65 у цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР.

М.М.Жданаў.

ЖДА́НАЎ Павел Ільіч (16.1.1903, г. Слонім Гродзенскай вобл. — 30.8.1986), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Мінскае ваен. пях. вучылішча (1930), курсы пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1936), курсы «Выстрал» (1942). У Чырв. Арміі з 1925. У Вял. Айч. вайну на Зах., Бранскім, Цэнтр., 1-м Укр. франтах. Камандзір стралк. палка падпалкоўнік Ж. вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дзясны на Пд ад Чарнігава і Дняпра на Пн ад Кіева. Да 1957 на гасп. рабоце.

ЖДА́НАЎ Уладзімір Пятровіч (н. 28.1.1949, в. Селішча Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. — 19.2.1995), бел. тэатральны мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1982). З 1984 працаваў у Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі (з 1986 гал. мастак), адначасова выкладаў

Я.Ждан. Гімн жыццю. 1997.

У.Жданаў. Эскіз дэкарацыі да спектакля «Халопка» М.Стрэльнікава.

у Бел. тэатр.-маст. ін-це (1988—89) і Ін-це культуры (1988—90). Работы вылучаюцца разнастайнасцю творчай манеры, ад тонкай стылізацыі да абагульненасці. Аформіў спектаклі: «Месье Амількар, або Чалавек, які плаціць» І.Жаміяка (1983), «Эмігранты» С.Мрожака (1989), «Блакітная ружа» Т.Уільямса і «Бездань» М.Матукоўскага (1991) і інш. ў Бел. т-ры імя Я.Купалы; «Калі лялькі не спяць» Л.Мілевай (1983) у Бел. рэсп. т-ры юнага гледача; «Кармэн» Ж.Бізэ (1990) у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі; «У наступным годзе ў гэты ж час» Б.Слэйда (1990) у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі; «Залёты» В.Дуніна-Марцінкевіча (1992) у Бел. т-ры імя Я.Коласа; «Сірано» С.Пажлакова (1984), «Сільва» І.Кальмана (1986), «Клоп» У.Дашкевіча (1988), «Хэло, Долі!» Дж.Германа (1992), «Халопка» М.Стрэльнікава (1994) і інш. ў Дзярж. т-ры муз. камедыі, а таксама ў муз. і драм. т-рах Краснаярска, Магадана (Расія), Чыятура (Грузія). З 1988 чл. праўлення Савета міжнар. асацыяцыі сцэнографаў і тэхнікаў т-ра.

Н.Я.Бунцэвіч.

ЖДАНО́ВІЧ Генадзь Міхайлавіч (н. 8.3.1933, Мінск), бел. вучоны ў галіне парашковай металургіі і кампазіцыйных матэрыялаў. Д-р тэхн. н. (1971), праф. (1973). Скончыў БПІ (1955). З 1956 у Бел. політэхн. акадэміі. Навук. працы па тэарэт. і эксперым. даследаваннях дэфармацыйнага механізму ўшчыльнення парашковых цел і выяўленні заканамернасцей працэсу прасавання метал. парашкоў.

Тв.: Теория прессования металлических порошков. М., 1969.

ЖДАНО́ВІЧ Ірына Фларыянаўна (27.9.1906, Мінск — 3.12.1994), бел. актрыса, педагог. Нар. арт. Беларусі (1940). Дачка Ф.*Ждановіча*. Сцэн. дзейнасць пачала ў Першым т-ве бел. драмы і камедыі (Данілка ў «Раскіданым гняздзе» Я.Купалы). У 1920—62 у т-ры імя Я.Купалы, у 1962—69 педагог Бел. тэатр.-маст. ін-та. Актрыса вял. драм. тэмпераменту, высокай сцэн. культуры. Яе акцёрскі стыль меў акрэсленую рамант. афарбоўку. Сярод роляў: Марылька («Бацькаўшчына» К.Чорнага), Аня («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона,

І.Ф.Ждановіч.

Ф.П.Ждановіч.

Дзярж. прэмія СССР 1948), Вера («Апошнія» М.Горкага), Людміла, Негіна («Позняе каханне», «Таленты і паклоннікі» А.Астроўскага), Дзіяна («Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі), Джульета («Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра).

Літ.: Кузняцова К. Ірына Ждановіч. Мн., 1970.

ЖДАНО́ВІЧ Казімір, прыдворны архітэктар; будаўнік князёў Радзівілаў у 1-й пал. 18 ст. ў Нясвіжы. Прадстаўнік архітэктуры барока. Аднавіў і перабудаваў *Нясвіжскі палацава-замкавы комплекс* (пасля 1726), пабудаваў палацавую капліцу (1740), т-р Радзівілаў «камедыхаўз» (1747—48).

ЖДАНО́ВІЧ Уладзімір Міхайлавіч (н. 20.1.1936, Мінск), бел. вучоны ў галіне канструявання і вытв-сці ЭВМ. Канд. тэхн. н. (1971), праф. (1991). Брат Г.М.*Ждановіча*. Скончыў БПІ (1959). З 1964 у Мінскім радыётэхн. ін-це, з 1990 прэзідэнт Бел. асацыяцыі дзелавога супрацоўніцтва з замежнымі краінамі «Навукова-вытворчае і сацыяльнае развіццё». Навук. працы па інтэнсіўных тэхналогіях вытв-сці дэталей радыёэлектроннай апаратуры. Аўтар вучэбных дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Технические средства ЭВМ. Элементная и конструктивная база. Мн., 1991 (разам з У.П.Лугоўскім, І.М.Русаком); Технические средства ЭВМ. Устройства ввода-вывода. Мн., 1991 (у сааўт.).

ЖДАНО́ВІЧ Фларыян Паўлавіч (28.10.1884, Мінск — 22.10.1937), тэатральны дзеяч, акцёр, рэжысёр. Адзін з заснавальнікаў бел. прафес. т-ра. Скончыў драм. школу ў Варшаве (1902). У арганізаваных ім драм. калектывах ставіў спектаклі на бел. мове («Па рэвізіі» М.Крапіўніцкага, 1907, «Паўлінка» Я.Купалы, 1913). Адзін са стваральнікаў *Першага таварыства беларускай драмы і камедыі*, у 1917—20 маст. кіраўнік і рэжысёр. У 1919 некаторы час працаваў у Вільні, дзе паставіў «Раскіданае гняздо» Я.Купалы. Як рэжысёр абапіраўся на практыку папярэднікаў (І.*Буйніцкага* і інш.) і традыцыі бел. нар. т-ра, імкнуўся да жыццёвай дакладнасці і праўдзівасці, шырока выкарыстоўваў у пастаноўках нар. музыку, спевы. Быў арганізатарам і першым маст. кіраўніком (1920—21), у 1922—29 вядучым акцёрам БДТ-1 (цяпер Нац. т-р імя Я.Купалы). Перанёс на яго сцэну свае лепшыя пастаноўкі з таварыства: «Рысь» і «Хам» паводле Э.Ажэшкі, «Паўлінка» і «Раскіданае гняздо» Я.Купалы, «Міхалка» Далецкіх, «Модны шляхцюк» К.Каганца, «Апошняе спатканне» У.Галубка, «Сягонняшнія і даўнейшыя» К.Буйло і інш.; паставіў новыя: «Прымакі», «Сон на кургане» і «Адвечная песня» Я.Купалы, «Ганка» У.Галубка і інш. У БДТ-3 паставіў спектаклі «Кастусь Каліноўскі» (1929), «Ярасць» Я.Яноўскага (1930). Акцёр шырокага творчага дыяпазону, стваральнік яркіх драм. і камедыйных вобразаў. Яго акцёрскай індывідуальнасці ўласцівы глыбокае пранікненне ў псіхал. сутнасць характару, асэнсаванне сац. прыроды персанажаў, выразны вонкавы малюнак ролі, жанравая разнастайнасць: Быкоўскі, Сымон («Паўлінка», «Раскіданае гняздо»), Рычард Даджэн («Вучань д'ябла» Б.Шоу), цётка Чарлея («Цётка з Бразіліі» Б.Томаса). З 1926 пачаліся ганенні на Ж. 18.7.1930 ён арыштаваны, засуджаны на 5 гадоў зняволення, працаваў на Беламорканале. 8.7.1937 зноў арыштаваны, прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1956.

Літ.: Атрошчанка А. Фларыян Ждановіч: Біягр. нарыс. Мн., 1972; Сабалеўскі А. Асоба мастака. Літ.-крытыч. артыкулы. Мн., 1992.

І.Ждановіч у ролях Марылькі (злева) і Дзіяны.

ЖДАНО́ВІЧЫ, вёска ў Мінскім р-не, каля вадасх. Крыніца, на аўтадарозе Мінск—Заслаўе. Чыг. ст. на лініі Мінск—Маладзечна. Цэнтр сельсавета.

За 12 км на ПнЗ ад г. Мінск. 5669 ж., 660 двароў (1997). Дарожна-буд. ўпраўленне № 5, ПМК № 1, гідрагеал. станцыя, рамонтна-буд. ўпраўленне, з-д безалкагольных напіткаў. Рэсп. інтэрнат ветэранаў вайны і працы. Мінская абл. школа глухіх дзяцей, дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр, дзіцячы дом, сярэдняя школа, 4 б-кі, амбулаторыя, аптэка, 3 аддз. сувязі. Каля вёскі курорт *Ждановічы*.

Курорт **Ждановічы**.

ЖДАНО́ВІЧЫ, бальнеагразевы і кліматычны курорт на Беларусі. За 12 км ад Мінска, непадалёку ад вадасховішча Заслаўскага (Мінскага м.) і Дразды. Засн. ў 1922. Асн. лек. фактары — умерана кантынентальны клімат, мясц. мінер. воды (хларыдна-сульфатна-натрыевая і хларыдна-натрыевая), сапрапелевыя і інш. грязі выкарыстоўваюцца для лячэння хвароб страўніка, кішэчніка, печані, жоўцевага пузыра, парушэнняў абмену рэчываў, рэабілітацыйна-аднаўленчага лячэння пасля аперацый.

ЖЖО́НАЎ Георгій Сцяпанавіч (н. 22.3.1915, С.-Пецярбург), рускі акцёр. Нар. арт. СССР (1980). Скончыў Ленінградскае тэатр. вучылішча (1935). У 1939—46 і 1947—54 рэпрэсіраваны, двойчы рэабілітаваны. У 1954—65 працаваў у т-рах Магадана і Нарыльска, з 1969 у Маск. т-ры імя Массавета. Выконвае ў асноўным ролі сучаснікаў, раскрывае індывід. рысы персанажа, амаль не карыстаючыся грымам: Забродзін («Ленінградскі праспект» І.Штока), Панаеў («Чорны гардэмарын» А.П.Штэйна) і інш. (больш за 200). У кіно з 1933. Сярод фільмаў: «Беражыся аўтамабіля», «Чалавек, якога я кахаю», «Уся каралеўская раць» (тэлевізійны), «Гарачы снег» (за ролю генерала Бяссонава Дзярж. прэмія Расіі 1975 і Сярэбраны медаль імя Даўжэнкі), «Памылка рэзідэнта», «Лёс рэзідэнта», «Вяртанне рэзідэнта», «Экіпаж» і інш.

«ЖЫВА́Я СТАРЫНА́», часопіс. Выдаваўся ў 1890—1916 у Пецярбургу аддзяленнем этнаграфіі Рус. геагр. т-ва на рус. мове 4 разы ў год. Друкаваў даследаванні і матэрыялы па фальклору і этнаграфіі народаў Расіі, а таксама замежжа. Асн. ўвагу надаваў апісанню побыту, абрадаў, жылля, адзення, нар. медыцыне. З артыкуламі, прысвечанымі бел. фальклору і этнаграфіі, выступалі У.М.Дабравольскі, М.В.Доўнар-Запольскі («Заметкі па беларускай этнаграфіі»), Я.Ф.Карскі, М.М.Косіч («Ліцвіны-беларусы Чарнігаўскай губерні, іх побыт і песні»), Е.Р.Раманаў, М.А.Саковіч, А.К.Сержпутоўскі, П.В.Шэйн. Сярод публікацый — рэцэнзіі на працы бел. фалькларыстаў і этнографаў, справаздачы па этнагр. экспедыцыі.

Г.А.Пятроўская.

«ЖИЗНЬ ПРОВИ́НЦИИ», грамадска-палітычная, эканам. і літ. газета. Выходзіла з 11(24).4 да 18(31).5.1907 у Мінску штодзённа на рус. мове. Рэдактар І.М.Глоба-Міхайленка. Прадаўжала праграму забароненай газ. *«Голос провинции»*. Ацэньвалася цэнзурай як газета «апазіцыйнага кірунку... са схільнасцю да чыста рэвалюцыйных выхадак». З пазіцый, блізкіх да меншавізму, асвятляла рабочы і сацыяліст. рух. У памфлетах і вершах-пародыях выкрывала лідэраў чарнасоценных партый, іх мясц. орган «Минское слово», палітыку царызму. Змяшчала інфармацыю пра падзеі ў горадзе. Прызнавала нац. самастойнасць беларусаў, крытыкавала шавіністычную палітыку царызму і польскай буржуазіі ў Беларусі. Праграму «Ж.п.» прадаўжала газета *«Окраина»*. *У.М.Конан.*

ЖЛОБ, тып бел. нар. лялечнага т-ра *батлейка*. Найб. быў пашыраны на Віцебшчыне ў 17—19 ст. Спалучаў статычную лялечную панараму з рухомым т-рам ценяў. Паказы адбываліся на Каляды, звязаны з рэліг. святам нараджэння Хрыста. На Віцебшчыне словам «Ж.» наз. яслі для кармлення жывёлы; паводле падання, Хрыстос у час пакланення вешчуноў ляжаў у яслях.

Знешне Ж. нагадваў макет 2-яруснай 3-купальнай царквы. Ніжні ярус меў 3 нішы-аддзяленні. У сярэдняй, са шклянымі дзвярамі, у час паказу запальвалі свечку і статычная лялечная мізансцэна адлюстроўвалася на задняй люстраной сцэнцы. Аддзяленні, дзе адбывалася дзеянне (верхні ярус і бакавыя нішы ніжняга), заклейваліся прамасленай паперай — экранамі, за якімі ставілі вяртушкі (рухала іх цяпло ад запаленай свечкі або батлейшчык) з сілуэтамі. Паказы нараджэння Хрыста і пакланення яму вешчуноў суправаджаліся спяваннем псальмаў і кантаў.



Канструкцыя вяртушкі ў віцебскім жлобе.

ЖЛО́БА Анатоль Піліпавіч (21.10.1923, пас. Папоўка Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 19.8.1995), бел. вучоны-хірург. Д-р мед. н. (1988), праф. (1991). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1954). У 1968—95 працаваў у ім (у 1971—85 рэктар). Навук. працы па праблемах абдамінальнай хірургіі, дыягнастычнага значэння пункцыі брушной поласці пры закрытай траўме жывата, інстр. метадах дыягностыкі хвароб брушной поласці, даследаваннях гемапунктату пры пазаматачнай цяжарнасці. Вынаходнік хірург. іголкі для пункцыі брушной поласці.

ЖЛО́БА Людміла Аляксандраўна (н. 16.5.1947, г. Новасібірск, Расія), бел. архітэктар. Скончыла Новасібірскі інж.-буд. ін-т (1971). З 1973 працуе ў ін-це «Мінскпраект». Асн. работы ў Мінску: рэканструкцыя парку імя Горкага (1975, у сааўт.) і часткі праспекта Скарыны (1985), арх.-ландшафтныя комплексы ўсх. раёнаў горада на аснове Сляпянскага водна-паркавага паўкальца (Дзярж. прэмія СССР 1989), рэканструкцыя і аднаўленне парку ў Нясвіжы (1990, у сааўт.).

ЖЛО́БА Мікалай Фёдаравіч (н. 5.1.1935, г. Гомель), бел. архітэктар. Скончыў БПІ (1960). Працаваў з 1952 у канструктарскім бюро Мін-ва гандлю, з 1962 у Ін-це будаўніцтва і архітэктуры, з 1971 у «Белкамунпраекце», з 1974 у «Мінскпраекце». Асн. работы ў Мінску: рэканструкцыя парку імя Горкага (1975) і тэр. стадыёна «Дынама» (1980), арх.-ландшафтныя комплексы ўсх. раёнаў горада на аснове Сляпянскага водна-паркавага паўкальца (Дзярж. прэмія СССР 1989), 17 паркаў і сквераў вакол водна-паркавай сістэмы (1988), добраўпарадкаванне набярэжнай р. Свіслач ад Камсамольскага воз. да вадасх. Дразды (1989), помнік партызанам-падпольшчыкам братам Сянько (1973, у сааўт.). Сярод інш. работ: праект генплана г. Старыя Дарогі (1967), паркі ў Оршы (1971), Віцебску (1972), Кобрыне (1973), Асіповічах (1982), рэканструкцыя і аднаўленне парку ў Нясвіжы (1990, у сааўт.).

ЖЛО́БІН, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Прыстань на р. Дняпро. За 83 км ад Гомеля. Вузел чыгунак на Мінск, Магілёў, Гомель, Калінкавічы і аўтадарог на Бабруйск, Гомель, Рагачоў, Светлагорск. 69,8 тыс. ж. (1997).

Вядомы з 15 ст. ў ВКЛ, належаў Хадкевічам. З сярэдзіны 16 ст. ў Рэчыцкім пав. Мін-

скага ваяв. У 15—17 ст. існаваў *Жлобінскі замак*. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ. У канцы 19 ст. праз Ж. пракладзена Лібава-Роменская чыг., у 1902 чыг. Пецярбург—Адэса. У 1880 і 1909 амаль поўнасцю знішчаны пажарам. У 1897 — 2100 ж. Дзейнічалі цагельнае, гарбарнае, крупадзёрнае прадпрыемствы. З 17.7.1924 цэнтр раёна, з 3.7.1925 горад. У 1939 — 19,3 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну з 14.8.1941 па 26.6.1944 акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі, якія ў горадзе і раёне загубілі 3091 чал. Дзейнічала *Жлобінскае патрыятычнае падполле*. У 1959 — 19,2 тыс. ж., у 1970 — 25,4 тыс. ж.

Прадпрыемствы лёгкай (*Жлобінская фабрыка штучнага футра*), металургічнай (*Беларускі металургічны завод*), харч., буд. матэрыялаў прам-сці; *Жлобінская фабрыка інкрустацыі*. Дзейнічае *Жлобінскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Вайсковыя могілкі, магілы ахвяр фашызму і падпольшчыкаў.

Рудня (А.П.Капусцін, М.Г.Маршын), Шапарня (У.Б.Паўлаў). Падпольшчыкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро, збіралі зброю і перадавалі яе партызанам, з якімі сумесна праводзілі дыверсіі па знішчэнні транспарту, баявой тэхнікі і жывой сілы акупантаў, знішчалі паравозы, на некалькі дзён паралізавалі дзейнасць чыг. вузла. У гонар баявых дзеянняў падпольшчыкаў і партызан на развілцы дарог каля в. Лугавая Вірня Жлобінскага р-на пастаўлены абеліск. *М.Ф.Шумейка.*

ЖЛО́БІНСКАЯ ІНКРУСТА́ЦЫЯ, агульнапрынятая назва дэкар.-прыкладных вырабаў *Жлобінскай фабрыкі інкрустацыі*. Куфэркі, пано чорнага або карычневага колеру. аздабляюць у тэхніцы аплікацыі ўзорыстымі кампазіцыямі з залацістай ці паліхромнай саломкі. Нарэзаныя квадрацікамі, ромбікамі, прамавугольнічкамі кавалачкі разгладжаных саломінак наклейваюцца на драўляную аснову, потым вырабы пакрываюць слоем бясколернага лаку. Промысел заснаваны на мясц. нар. традыцыях аплікацыі саломкай куфэркаў, сальніц, рамак для фотаздымкаў і інш.

Жлобін. Фрагмент забудовы Цэнтральнай плошчы.

ЖЛО́БІНСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала са жн. 1941 да ліст. 1943 у Жлобіне і раёне Гомельскай вобл. Групы дзейнічалі ў Жлобіне: у паравозным дэпо (кіраўнік М.І.Елісееў, І.М.Казлоў, Г.В.Канапляннікава, Ц.П.Міненкаў, А.П.Цямінская), друкарні (Р.П.Баранаў, М.П.Калеснічэнка), раённай б-цы (У.М.Лабанаў), у вёсках Антонаўка (А.І.Севасцьянчык), Бабоўка (Н.А.Дражын), Кабанаўка (М.Дз.Антуськоў), Мормаль (І.А.Лебедзеў), Святое (А.І.Карунчык), Шчадрын (Л.М.Жураўлёва); у Малевіцкім сельсавеце (І.М.Шаўцоў). У 1942 узніклі новыя групы ў Жлобіне (Гарбатаў, С.А.Казлоў, Дз.В.Ніжнікаў, Т.І.Раміська, І.І.Цыркуноў), у вёсках Адраджэнне (П.Б.Кіраў), Папаратнае (В.З.Фамянок), Сельнае (П.С.Дзегцяроў), Старая

Жлобінская інкрустацыя.

У пач. дзейнасці ф-кі геам. дэкор паўтараў тканыя нар. вырабы, кавалачкі саломкі фарбавалі ў розныя колеры. Пазней майстры выпрацавалі ўласны стыль аплікацыі, адмовіліся ад паліхроміі, падкрэсліваючы натуральны колер саломы. Дробнаўзорысты геам. малюнак вызначаецца гарманічным спалучэннем розных адценняў кавалачкаў саломы — ад амаль белага да светла-карычневага. Часта вырабы паводле канструкцыі і характару размяшчэння дэкору імітуюць куфры. Кампазіцыі пано адлюстроўваюць сцэнкі з жыцця, фалькл., літ. і казачныя сюжэты. Сярод майстроў М.В. і В.Н.Дзехцярэнкі, В.П.Котаў і інш. *Я.М.Сахута.*

ЖЛО́БІНСКАЯ СЕДЛАВІ́НА, тэктанічная структура на У Беларусі. Аддзяляе *Беларускую антэклізу* ад *Варонежскай антэклізы* і з'яўляецца перамычкай паміж *Аршанскай упадзінай* і *Прыпяцкім прагінам*. Даўж. 50 км, шыр. 45 км. Крышт. фундамент у межах Ж.с. залягае на глыбіні ад -650 да -900 м. Платформавы чахол складзены пераважна з рыфейскіх і вендскіх адкладаў, якія перакрываюцца сярэднедэвонскімі, юрскімі, мелавымі, палеагенавымі, неагенавымі і антрапагенавымі ўтварэннямі. Пачатак фарміравання Ж.с. ў познім пратэразоі. Блізкі да сучаснага выгляду седлавіна набыла ў канцы герцынскага этапу. У палеазоі і да сярэдняга мезазою на тэрыторыі Ж.с. пераважалі ўзыходныя тэктанічныя рухі. У жывецкі час дэвонскага перыяду, юрскім мелавым, палеагенавым перыядах раён седлавіны падвяргаўся адмоўным тэктанічным рухам і быў неглыбокім морам.

У.І.Шкуратаў.

ЖЛО́БІНСКАЯ ФА́БРЫКА ІНКРУСТА́ЦЫІ. Створана ў 1961 на базе цэха інкрустацыі саломкай Гомельскай ф-кі маст. вырабаў. Асн. прадукцыя — разнастайныя куфэркі, пано, аздобленыя саломкай. Промысел заснаваны на мясц. нар. традыцыях аплікацыі саломкай. Выпускае таксама строчана-вышытыя вырабы, пано з разьбой і размалёўкай на чорным фоне і інш.

ЖЛО́БІНСКАЯ ФА́БРЫКА ШТУ́ЧНАГА ФУ́ТРА. Дзейнічае з 1978 у г. Жлобін Гомельскай вобл. З 1984 вытв. аб'яднанне. Уключала швейную ф-ку. З 1996 адкрытае акц. т-ва «Белфа» (без швейнай ф-кі). Адно з найб. у Еўропе прадпрыемстваў па вытв-сці трыкат. штучнага футра для адзення, абутку, галаўных убораў, цацак, галантарэйных і інш. вырабаў.

ЖЛО́БІНСКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1989 у г. Жлобін Гомельскай вобл., адкрыты ў 1992. Пл. экспазіцыі 243 м^2, каля 6 тыс. экспанатаў асн. фонду (1997). Сярод прадметаў даўніны бівень і косці маманта, неалітычныя крамянёвыя прылады працы, керамічныя вырабы, знойдзеныя на тэр. раёна, макет паселішча 15 ст., прылады працы і прадметы побыту 17—19 ст., дыярамы пра буд-ва Лібава-Роменскай чыгункі (1873), рэв. выступленні чыгуначнікаў (1905) і інш.

Вял. экспазіцыя прысвечана падзеям часоў Вял. Айч. вайны: абарончым баям Чырв. Арміі, дзейнасці *Жлобінскага патрыятычнага падполля*, партыз. руху ў раёне, матэрыялам пра *Азарыцкія лагеры смерці*, вызваленню Жлобіншчыны ад ням.-фаш. захопнікаў; захоўваюцца асабістыя рэчы славутых землякоў. Экспанаты знаёмяць з развіццём у пасляваенны час асветы, навукі, культуры і спорту, гаспадаркі, прадпрыемстваў у горадзе і раёне. *Я.В.Карцаў.*

ЖЛО́БІНСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 15—17 ст. у г. *Жлобін* Гомельскай вобл. Размяшчаўся на правым беразе Дняпра. Складаўся з уласна замка (60 × 50 м) і падзамка (130 × 60 м), размешчанага на 1,5—2 м ніжэй за замкавы дзядзінец. Увесь комплекс узвышаўся на 3—4 м над прырэчнай жылой зонай сярэдневяковага паселішча. Ж.з. быў умацаваны земляным валам і драўлянымі сценамі-гароднямі з вежамі і брамамі. У ліп. 1654 казакі ўкр. гетмана І.Н.Залатарэнкі ўзялі штурмам і спалілі «замок Злобин». Больш познія звесткі пра Ж.з. не выяўлены.

ЖЛО́БІНСКІ РАЁН, на ПнУ Гомельскай вобл. Утвораны 17.7.1924 (у сучасных межах з 1962). Пл. 2,1 тыс. км^2. Нас. 38,1 тыс. чал. (1997). Сярэдняя шчыльнасць 18 чал. на 1 км^2. Цэнтр раёна — г. *Жлобін*; г.п. Стрэшын, 156 сельскіх нас. пунктаў. Падзяляецца на Стрэшынскі пасялковы Савет і 16 сельсаветаў: Акцябрскі, Верхнеалбянскі, Дабрагашчанскі, Кабанаўскі, Кароткавіцкі, Кіраўскі, Луцкі, Майскі, Малевіцкі, Навамаркавіцкі, Папаратнянскі, Пірэвіцкі, Салонскі, Старарудняскі, Чырвонабярэжскі, Шчадрынскі.

Раён размешчаны пераважна ў межах *Гомельскага Палесся*, паўн.-зах. ч. ў межах *Цэнтральнабярэзінскай раўніны*, асноўная ч. тэр. занята *Прыдняпроўскай нізінай*. Паверхня плоская з выш. 130—145 м. Найвыш. пункт 151,5 м (каля в. Дабрагошча). Карысныя выкапні: нафта, торф, гліны, пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -6,9 °С, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 595 мм за год. Вегетац. перыяд 193 сут. Рэкі: Дняпро з прытокамі Бярэзіна, Добасна, Окра і Ржаўка, прыток Бярэзіны р. Ала. Пашыраны глебы дзярнова-падзолістыя (40,6%), тарфяна-балотныя (13,2%). Пад лесам 31,1%. Пераважаюць хваёвыя і бярозавыя, сустракаюцца чорнаальховыя і дубовыя лясы. Балоты займаюць 2,9% тэр. Помнік прыроды — Чырвонабярэжскі парк, гідралагічны заказнік Выдрыца.



Агульная плошча с.-г. угоддзяў 101 тыс. га, з іх асушана 32,4 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 19 калгасаў, 9 саўгасаў, Чырвонабярэжскі саўгас-тэхнікум, 2 птушкафабрыкі, прадпрыемствы па кормавытворчасці «Ала». Асн. галіна сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя, бульбу, лён, кармавыя культуры. Прадпрыемствы паліўнай (торфабрыкет), пач. апрацоўкі лёну (ільнозавод), харч. (мясакамбінат, малочны, крухмала-патачны з-ды) прам-сці; домабудаўнічы камбінат і камбінат буд. матэрыялаў. Лясгас. Здабыча фармовачных пяскоў. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Мінск—Гомель і Магілёў—Калінкавічы, аўтадарогі Бабруйск—Гомель, Рагачоў—Светлагорск. Суднаходства па Бярэзіне і Дняпры. У раёне 25 сярэдніх, 7 базавых, 7 пач. школ, Чырвонабярэжскі с.-г. тэхнікум, дапаможная школа-інтэрнат, 52 дашкольныя ўстановы, 37

Выдзеўбаная жлукта-кадаўб без дна ў цэбры. Вёска Запярынне Пухавіцкага раёна Мінскай вобл.

клубаў, 37 бібліятэк, 8 бальніц, 29 фельч.-ак. пунктаў. Помнікі архітэктуры: Пакроўская царква (1807) у г.п. Стрэшын, сядзіба — палаца-паркавы ансамбль (1890—1893) у в. Чырвоны Бераг; ветраны млын (19 ст.) каля в. Ляды, царква Усіх Святых (1902) у в. Пірэвічы.

Выдаецца аб'яднаная раённая і гарадская газ. «Новы дзень». *С.І.Сідор.*

ЖЛУ́КТА, у беларусаў бандарная пасудзіна для запарвання бялізны. Звычайна мела кадзепадобную форму, да 1 м у вышыню, на трох ножках (утваралася даўжэйшымі клёпкамі). Бялізну складвалі ў Ж. і залівалі шчолакам або перасыпалі попелам (найлепшым лічыўся попел бярозавай драўніны), потым залівалі кіпенем. Праз некаторы час ваду зліваліпраз адтуліну ў днішчы, якая закрывалася коркам, а бялізну паласкалі ў балеі ці ночвах. Часам у сял. гаспадарцы выкарыстоўвалі і больш архаічны від Ж. — кадаўб, зроблены са ствала дрэва без днішча, які ставілі ў цэбар ці кадку. У сял. побыце Ж. выкарыстоўвалі да сярэдзіны 20 ст. *В.С.Цітоў.*

ЖМА́КІН Ігар Канстанцінавіч (н. 24.7.1926, Кіеў), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі. Д-р мед. н. (1974), праф. (1977). Скончыў 1-ы Маскоўскі мед. ін-т (1951). З 1959 у Гродзенскім мед. ін-це (у 1961 прарэктар, з 1969 заг. кафедры). Навук. працы па фізіялогіі ц.н.с. і крывазвароту, сістэмных механізмах рэгуляцыі функцый, гісторыі фізіялогіі.

Тв.: Ангиотензиотонография в эксперименте и клинике. Мн., 1967 (у сааўт.).

«ЖМЕНЬ», «ц м е н ь», каменны метэарыт, які выпаў у 1858 каля в. Цмень Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Маса 246 г. Належыць да ахандрытаў. Асн. частка (116 г) зберагаецца ў Венскім нац. прыродазнаўча-гіст. музеі, 26,6 г — у калекцыі метэарытаў Рас. АН (Масква), 6,8 г — у Амер. музеі прыродазнаўчай гісторыі (Нью-Йорк). Гл. таксама *Метэарыты*.

Літ.: Бордон В.Е., Давыдов М.Н. Рожденные в космосе. Мн., 1982. С. 36—37. *У.Я.Бардон.*

ЖМІ́НДА, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Лебяда*.

ЖМО́ЙДЗЯК Расціслаў Афанасьевіч (н. 24.12.1936, в. Яжона Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. географ, картограф. Праф. (1989). Засл. работнік нар. адукацыі Беларусі (1992). Скончыў БДУ (1959). З 1961 у БДУ (з 1980 заг. кафедры геадэзіі і картаграфіі, з 1983 дэкан геагр. ф-та, з 1992 навук. кіраўнік Лабараторыі комплекснага картаграфавання БДУ). Навук. працы па тапаграфіі і картаграфіі, картаграфаванні с.-г. вытворчасці і насельніцтва, старшыня рэдкалегіі «Атласа БССР» (1990).

Тв.: Экономическая картография. Мн., 1973 (разам з В.Я.Крышчановічам); Полевая практика по топографии с основами геодезии. Мн., 1987 (разам з Б.А.Мядзведзевым). *П.М.Бараноўскі.*

ЖМУ́ДЗЬ, гл. *Жамойць*.

ЖМУ́ДСКАЕ ЎЗВЫ́ШША, тое, што *Жэмайцкае ўзвышша*.

ЖМУЙДЗІНА́ВІЧУС (Žmuidzinavičius) Антанас (31.10.1876, с. Сейрыяй Лаздзійскага р-на, Літва — 9.8.1966), літоўскі жывапісец. Нар. мастак Літвы (1954), нар. маст. СССР (1957). Чл.-кар. АМ СССР (1958). Вучыўся ў маст. акадэміях у Варшаве (1899—1901) і Парыжы (1905—06). Адзін з заснавальнікаў (1907) Суполкі літ. выяўленчага мастацтва, яго старшыня да 1934. З 1926 выкладаў у Каўнаскай маст. школе, у 1944—53 у розных вышэйшых школах; праф. (1947). Сярод твораў пераважа-

юць пейзажы, якім уласцівы рэаліст. вобразы, ідэалізацыя прыроды: «Нярыс каля Антакальніса» (1906), «Нёман перад навальніцай» (1917), «Дзве сасны» (1931), цыкл «Тут будзе Каўнаскае мора» (1953—59) і інш. Пісаў сюжэтныя карціны («Адпачынак», 1920, «Прачкі», 1926), партрэты (Т.Даўгірдаса, 1910, В.Міцкевіча-Капсукаса, 1945, і інш.).

А.Жмуйдзінавічус. Нёман перад навальніцай. 1917.

ЖМУ́РАЎКА, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе р. Дняпро, на аўтадарозе Рэчыца—Лоеў. Цэнтр сельсавета. За 3 км на Пд ад горада і чыг. ст. Рэчыца. 47 км ад Гомеля, 1801 ж., 910 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

Дз.П.Жмуроўскі.

ЖМУРО́ЎСКІ Дзмітрый Пятровіч (н. 10.1.1918, в. Барысавічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). Д-р гіст. н. (1973), праф. (1974). У 1938—41 вучыўся ў Магілёўскім пед. ін-це. Скончыў Маскоўскі пед. ін-т (1946). У Вял. Айч. вайну на Бранскім, Калінінскім, 2-м Укр. франтах. Удзельнік Курскай бітвы, Корсунь-Шаўчэнкаўскай і Яска-Кішынёўскай аперацый. Камандзір кулямётнага разліку сяржант Ж. вызначыўся ў сак. 1944 пры фарсіраванні р. Прут, паранены, не пакінуў поля бою. З 1950 на выкладчыцкай рабоце ў ВНУ Вільнюса, Масквы, Мінска. Аўтар даследаванняў па гісторыі КПСС і КПБ.

Тв.: Организаторская работа Коммунистической партии в деревне (1918—1920 гг.). Мн., 1970; Республика Советов: единство фронта и тыла (1918—1920 гг.). Мн., 1980; В борьбе за Советскую власть: Деятельность большевиков в бел. деревне, 1918—1920. Мн., 1989.

ЖНІ́ВЕНЬ (ад слова «жніво»), восьмы месяц каляндарнага года (31 дзень), апошні месяц лета на Беларусі. 15 Ж. працягласць дня ў Мінску 14 гадз 56 мін, сярэдняя выш. Сонца над гарызонтам 50,3°, сярэдняя сума сонечнай радыяцыі за месяц 478 МДж/м^2, радыяц. баланс дадатны (252 МДж/м^2). На тэр. Беларусі сярэдняя т-ра паветра 15,5—18 °С, у 2-й пал. Ж. магчымы замаразкі на глебе (часам і ў паветры). Звычайна Ж. халаднейшы за ліпень, але прыкладна раз у 5 гадоў бывае наадварот. Адносная вільготнасць паветра ў Ж. не ніжэй за 70%, ападкаў 60—85 мм, у асобныя гады можа быць і больш (149 мм, Бабруйск, Жыткавічы, 1970) ці ападкі зусім не выпадаюць (Лепель, 1939). У сярэднім з ападкамі бывае 14—16 дзён. Частыя ліўневыя дажджы з моцнымі вятрамі выклікаюць паляганне збожжавых культур. У Ж. канчаецца жніво азімых, убіраюць яравыя, лён. З сярэдзіны месяца пачынаецца сяўба азімых жыта і пшаніцы. Даспявае садавіна, у разгары збор брусніц, касцяніц, чаромхі, ажыны. Ж. самы багаты месяц на грыбы. Паступова пачынаюць адлятаць у вырай птушкі: стрыжы, ластаўкі, зязюлі, івалгі, мухалоўкі, валасянкі, пліскі. Збіраюцца ў чароды шпакі, гракі. У канцы Ж. размнажаюцца змеі, яшчаркі, пачынаецца гон у казуль, нараджаюцца зайчаняты (другі прыплод).

ЖНІ́ВЕНЬСКАЯ РЭВАЛЮ́ЦЫЯ 1945 у В'етнаме, нацыянальна-вызваленчае, нар.-дэмакр. і сацыяліст. выступленне ў канцы 2-й сусв. вайны. Падрыхтавана В'етмінем. 16 жн. пачалася ўсев'етнамская паліт. забастоўка пад лозунгам устанаўлення незалежнай рэспублікі. 19 жн. ў Ханоі ўзбр. рабочыя атрады пад кіраўніцтвам камуністаў скінулі праяпонскі ўрад. Пасля заняцця паўстанцамі гарадоў Хюэ (23 жн.) і Сайгон (25 жн.) імператар Бао-Дай адрокся ад прастола. 2 вер. на 500-тысячным мітынгу ў Ханоі *Хо Шы Мін* ад імя Часовага ўрада (створаны 27 жн.) абвясціў Дэкларацыю незалежнасці і ўтварэнне Дэмакр. Рэспублікі В'етнам. У ходзе рэвалюцыі створаны рэв. органы ўлады (нар. к-ты), зменена падатковая сістэма, праведзены перадзел абшчынных зямель, жанчыны ўраўнаваны ў правах з мужчынамі і інш.

Жодзішкаўскі кальвінскі збор.

ЖНІВО́, уборка ўраджаю збожжавых культур. Пры аднафазнай уборцы Ж. сумяшчаюць з малацьбой і робяць *збожжаўборачным камбайнам*, пры двухфазнай (раздзельная ўборка) спелыя культуры спачатку скошваюць жняркамі, потым валкі падбіраюць і абмалочваюць камбайнам. Шматфазная ўборка ўраджаю — вылучэнне асн. прадукцыі ў 3 этапы і болей. Спосаб уборкі вызначаецца біял. асаблівасцямі збожжавых культур, станам сцебластою, кліматычнымі ўмовамі і наяўнасцю неабходнай тэхнікі.

ЖНІ́ЎНЫЯ ПЕ́СНІ, жнейскія, жытныя песні, «жніво», частка летняга цыкла каляндарна-земляробчага фальклору. Вядомы пераважна ў слав. і балцкіх народаў. На Беларусі — узор традыц. сялянскай нар.-песеннай класікі. Выконваліся жнеямі на полі. Падзяляюцца на зажынкавыя, уласна жніўныя (гал. жанрава-тэматычная група) і дажынкавыя. Пераважае прац., сацыяльна- і сямейна-бытавая тэматыка; асн. матыў — выказванне гора, крыўды, якія жняя давярала ніве, скарга яе на непасільную працу, нялёгкае жыццё ў сям'і мужа з прыціпастаўленнем свайго і чужога дома, роднай і нянароднай маці, нараканне на адзіноцтва ўдавы, сіраты, шкадаванне аб страчанай

дзявочай прыгажосці. Вобразны лад вызначаюць псіхал. тонкасць, яркасць бытавых замалёвак. Разгорнутыя манало́гі жніяў (часам перарастаюць у дыялогі) уключаюць зварот да нівы, сонца, ветру, бору, хмар. У гумарыст. сюжэтах матыў скаргі амбівалентна пераасэнсоўваецца («Ох, і дайце ж мне раду, мой загонічак ззаду»). З часоў *прыгону ў Ж.п.* больш, чым у інш. каляндарна-земляробчых, выявілася антыпрыгонніцкая накіраванасць. У некат. песнях традыц. скарга жніяў набывае характар пратэсту, перарастае ў праклён («Бадай пана громы ўбілі, як мы ручкі патамілі»).

Напевы Ж.п. яскрава выяўляюць характэрны для алігатонных ладава-меладычных сістэм драматургічны прынцып адначасовага кантрасту — рознанакіраванасць выразных сродкаў пры іх раўнапраўнасці, што надае падобным напевам асаблівую выразнасць. Нягледзячы на невял. гукавы дыяпазон, напевы Ж.п. уражваюць шырынёй меладычнага дыхання, дзякуючы свабоднай імправізацыйнай рытміцы з доўга працягнутымі апорнымі гукамі ладу. У паўд. (Палессе) і ўсх. раёнах Беларусі Ж.п. гучаць напружана (накшталт плачу-галашэння), у паўн. (Паазер'е) пераважна ліpычна, у зах. і некат. цэнтр. раёнах часта набываюць эпічныя рысы (з эпічнымі зачынамі паэт. тэкстаў: «А заспорыў Дунай з морам за бедную сіраціну», «Да цераз лесы, цераз боры брат сястрыцы пакланяецца»). У асобных мясцовасцях Ж.п. збліжаюцца і нават зліваюцца з сенакоснымі (напевы, якія іх аб'ядноўваюць, наз. «лета»). Гучанне песень «лета», як і *веснавых песень*, яскрава прадстаўляе нар. школу *галаснога спеву*. Параўнальна невял. колькасць жніўных песень мае рытуальна заклінальны характар .(«Радзі, ніва, жыта, жыта і пшаніцу, усякую пашніцу»), дажынкавыя — велічальны, святочны, нярэдка афарбаваны ў гумарыст. тоны. Ад уласна жніўных яны адрозніваюцца меншай распеўнасцю, большай рытмічнай акрэсленасцю. Суправаджаюцца абрадамі «першага снапа» (зажынкавыя), «апошняга снапа» і «завівання барады» (дажынкавыя). І песні і абрады пранізвае адзін матыў — стаўленне да хлеба як да святыні.

Публ.: Беларускія народныя песні / Запіс Р.Шырмы. Т. 3. Мн., 1962; Жніўныя песні / Скл. А.С.Ліс, В.І.Ялтаў. Мн., 1974; Анталогія беларускай народнай песні / Уклад. Г.Цітовіч. 2 выд. Мн., 1975; Мажэйка З.Я. Песні Беларускага Паазер'я. Мн., 1981; Яеж. Песни Белорусского Полесья. Вып. 1. М., 1983.

Літ.: Мухаринская Л.С. Белорусская народная песня. Мн., 1977; Эвальд З.В. Социальное переосмысление жнивных песен Белорусского Полесья // Эвальд З. Песни Белорусского Полесья. М., 1979; Можейко З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии. Мн., 1985.

З.Я.Мажэйка.

Фрагмент забудовы горада **Жодзіна**.

ЖНЯЯ́РКА, машына для скошвання с.-г. культур і транспартавання скошанай масы ў малацільны апарат камбайна (*пры прамым камбайнаванні*) або ўкладкі *яе на поле ў валкі ці ў рассціл (пры раздзельнай уборцы)*. *Асн. рабочыя органы* — рэжучы апарат, матавіла, шнэк, транспарцёр.

Шнэкавыя Ж. (хедэры) бываюць навясныя (на *збожжасцёбарачныя камбайны*) або прычапныя да трактара; валковыя (платформавыя) — самаходныя ці ў агрэгаце з трактарамі, самаходнымі шасі, камбайнамі. Валковыя Ж. паводле размяшчэння рэжучага апарата падзяляюцца на франтальныя і бакавыя, паводле спосабу фармавання валкоў — на адна-, двух- і трохпаточныя (фармуюць валок рэзальным апаратам або яшчэ з дапамогай 1 ці 2 транспарцёраў). Ж. бываюць універсальныя і спецыяльныя (для ўборкі пэўных культур). Напр., зернебабовая Ж. — навясная на камбайны машына для скошвання і ўкладкі ў валкі зернебабовых культур (у т.л. зялёнага гарошку, іх сумесей) і палеглай збажыны. Мае пальцавы рэжучы апарат са сцёблападымальнікам, універсальнае эксцэнтрыкавае матавіла, раменна-планкавы транспарцёр, платформу, механізм прывода і інш. Шырыня захопу Ж. ад 3,5 да 17 м, прадукцыйнасць ад 1,2 да 8 га/гадз.

Жняяркі: 1 — навясная з універсальным матавілам для раздзельнай уборкі збожжа; 2 — збожжавая прычапная да трактароў; 3 — зернебабовая; 4 — канапляная жняярка-снопавязалка.

ЖО́ДЗІНА, горад абл. падпарадкавання ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Пліса. За 55 км ад Мінска. Чыг. ст. на лініі Мінск—Орша, на аўтадарозе Мінск—Масква. 59,9 тыс. ж. (1997).

Упершыню ўпамінаецца пад 1688 як в. Жодзіна Слабада Барысаўскага *староства* Мінскага ваяв., уласнасць Радзівілаў. Пасля 1793 у Рас. імперыі ў Барысаўскім пав. Мінскай губ. У 1871 праз Ж. прайшла чыгунка Масква—Брэст. У 1897 — 697 ж., 97 гаспадарак, царква (пабудавана ў 1864), нар. вучылішча, вадзяны млын, кузня, карчма, крама. З 1924 цэнтр сельсавета ў Смалявіцкім р-не. 21.1.1958 пасёлкі Смалявіцкай ДРЭС, з-да дарожных і меліярац. машын і суседнія вёскі Зарэчча і Крупынікі аб'яднаны з Ж. ў гар. пасёлак. У 1958 створаны Бел. аўтамаб. з-д (БелАЗ). З 7.3.1963 горад. У 1962—65 у складзе Барысаўскага р-на. У 1970 — 22,1 тыс. ж.

Смалявіцкая ДРЭС, *Беларускі аўтамабільны завод*, з-ды дарожных і меліярац. машын, цяжкіх кавальскіх штампавак. Прадпрыемствы харч., лёгкай (швейна-трыкат. ф-ка і інш.), дрэваапр., буд. матэрыялаў прам-сці. *Жывёлагадоўлі Беларускі НДІ, Земляробства і кармоў Беларускі НДІ.* Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, *Манумент у гонар маці-патрыёткі*.

ЖО́ДЗІНСКІ ПАЛІТЭХНІ́ЧНЫ ТЭ́ХНІКУМ. Засн. ў 1973 на базе Жодзінскага філіяла (з 1966) Мінскага аўтамех. тэхнікума. Рыхтуе тэхнікаў-электрыкаў, тэхнікаў-тэхнолагаў, бухгалтараў-менеджэраў. Спецыяльнасці (1997/98 навуч. г.): электратэхніка; тэхналогія, абсталяванне і аўтаматызацыя апрацоўкі матэрыялаў; тэхналогія, абсталяванне і аўтаматызацыя машынабудавання; тэхн. абслугоўванне тэхнал. абсталявання і сродкаў робататэхнікі ў аўтаматызаванай вытв-сці; менеджмент; бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт (на камерцыйнай

аснове). Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае.

ЖО́ДЗІШКАЎСКІ ЕЗУІ́ЦКІ КАЛЕ́ГІУМ. Дзейнічаў у 1709—73 у в. *Жодзішкі*. У 1708 уладальніца Жодзішак Барбара Мінкевіч ахвяравала езуітам 6 вёсак. Спачатку калегіум размяшчаўся пры парафіяльным касцёле св. Тройцы, з 1727 пры новым касцёле св. Іуды Фадзея. У 1745 пры ім адкрыта муз. бурса, у 1767 — аптэка. У 1757—70 пабудаваны новы вучэбны корпус. Да 1762 калегіум узначальвалі віцэ-рэктары, потым — рэктары. Праграма была традыцыйнай для езуіцкіх калегіумаў, з 1770 выкладаліся таксама ням., франц. мовы, матэматыка. Пасля скасавання ордэна езуітаў пераабсталяваны пад сядзібу новых гаспадароў Жодзішак Ласкарысаў.

ЖО́ДЗІШКАЎСКІ КАЛЬВІ́НСКІ ЗБОР, помнік архітэктуры рэнесансу. Пабудаваны ў 1612 у в. Жодзішкі (Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.), у пач. 19 ст. перабудаваны пад Троіцкі касцёл. Першапачаткова храм быў 1-нефавы, прамавугольны ў плане, без апсіды, з двух'яруснай чацверыковай вежай-званіцай на гал. фасадзе. Пры перабудове да нефа прыбудаваны вял. прамавугольныя ў плане бакавыя капліцы з трохвугольнымі шчытамі ў завяршэнні тарцовых сцен. Цяпер — мураваны крыжападобны ў плане 1-нефавы будынак з квадратнай у плане алтарнай апсідай з сакрысціяй з Пн і вуглавымі контрфорсамі. Гал. фасад вырашаны плоскасна, завершаны шчытом, партал увахода афармлены рустыкай. Скляпенні капліц упрыгожаны размалёўкай (мастак П.Сергіевіч, 1937).

А.А.Міцянін, А.А.Ярашэвіч.

ЖО́ДЗІШКІ, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Вілія, на аўтадарозе Варняны—Нарач. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 19 км на Пн ад горада і чыг. ст. Смаргонь, 240 км ад Гродна. 891 ж., 251 двор (1997).

Вядомыя з 1511 як замак і мястэчка, засн. М.Мішковічам. У 16—17 ст. належалі Падбейпецічам, Забярэзінскім, Осцікавічам, Кішкам, Комарам, Мінкевічам. У 1709—73 дзейнічаў *Жодзішкаўскі езуіцкі калегіум*. З 1795 у Рас. імперыі. У сярэдзіне 19 — пач. 20 ст. ў Свянцянскім пав. Віленскай губ. У 1859 — 222 ж., 39 двароў. З 1921 у Польшчы, у Вілейскім пав. Віленскага ваяв. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета ў Смаргонскім р-не. У 1971 — 794 ж., 276 двароў.

Малое прадпрыемства «Надзея», лясніцтва. Сярэдняя школа, дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Лясная паляна», Дом культуры, б-ка, 2 бальніцы, амбулаторыя, 2 аптэкі, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнікі архітэктуры — *Жодзішкаўскі кальвінскі збор* (1612) і сядзібны дом (з пейзажным паркам 19 ст.), пад які прыстасаваны кляштар езуітаў 17 ст.

ЖО́ДЗІШСКІ ШКО́ЛЬНЫ ТЭА́ТР. Існаваў пры езуіцкім калегіуме ў в. Жодзішкі Смаргонскага р-на ў 1-й трэці 18 ст. Захаваліся праграмы трох пастановак 1716—30: канікулярная драма «Вянец духа-красамоўства» (са стараж.-рым. гісторыі) з інтэрлюдыямі пасля 1-га і 2-га актаў; масленічная «Палемонія за сталом, якую, па прыкладу Вітэлія, спасцігла смерць» з аргументам П.Каяловіча (1724, з алегарычным антыпралогам, харамі і інтэрлюдыямі паміж актамі) і «Перамога саюзу любві» (1730).

ЖО́ЛАБ АКІЯНІ́ЧНЫ, глыбакаводны жолаб, вузкае доўгае паніжэнне дна акіяна, элемент рэльефу пераходнай зоны паміж мацерыком і акіянам. Даўжыня дасягае некалькіх тысяч кіламетраў, шырыня — дзесяткаў і соцень кіламетраў, глыб. больш за 5000 км, сярэдняя стромкасць схілаў каля 5°, у месцах глыбінных разломаў схілы бываюць вельмі стромкія. Размяшчаюцца ўздоўж горных узбярэжжаў мацерыкоў (напр., Перуанскі і Чылійскі жалабы каля зах. берагоў Паўд. Амерыкі) або са знешняга боку астраўных дуг (Алеуцкі, Курыла-Камчацкі, Японскі, Філіпінскі жалабы). З Ж.а. звязаны макс. глыбіні Сусветнага ак., у т.л. найб. на Зямлі глыб. 11022 м (у Марыянскім жолабе Ціхага ак.).

ЖО́ЛАБАЎ Віталь Міхайлавіч (н. 18.6.1937, с. Старая Збур'еўка Херсонскай вобл., Украіна), савецкі касманаўт. Герой Сав. Саюза (1976), лётчык-касманаўт СССР (1976). Скончыў Азербайджанскі ін-т нафты і хіміі (1959), Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна (1974). У 1963—81 у атрадзе касманаўтаў. 6.7—24.8.1976 з Б.В.*Валынавым* здзейсніў палёт на касм. караблі «Саюз-21» (як бортінжынер) і на арбітальнай станцыі «Салют-5». Правёў у космасе 49,3 сут.

ЖО́ЛТАК Валяр'яна Канстанцінаўна (н. 13.12.1919, г. Жлобін Гомельскай вобл.), бел. жывапісец. Скончыла Віцебскае маст. вучылішча (1939). У 1939—51 мастак-дэкаратар Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Працуе ў жанрах бытавым — «Зіма прыйшла» (1954), «У школу» (1963), «Вясна. 1930-я гады» (1972), «Кірмаш» (1984), нацюрморта — «Сон-трава» (1957), «Званочкі лясныя» (1958), «Суровыя гады» (1975), «Інтэр'ер з народнай керамікай» (1980), «Сухія кветкі» (1985), «Аканіт» (1988—89), «Успаміны пра лета» (1994), пейзажа — «Разліў на Бярэзіне» (1958), «Вязынка» (1964), «Бярозавыя карункі» (1993), «Полацк. Спаса-Ефрасіннеўская царква» (1994), серыі пейзажаў Закарпацця (1967), Ноўгарада і Пскова (1969), Сібіры і Крыма (1970) і інш. На тэму Вял. Айч. вайны карціны «За дапамогай да партызан» (1957), «Вяртанне» (1958, 1967). Іл. гл. таксама да арт. *Бытавы жанр*.

Л.Ф.Салавей



В.Р.Жолудзеў.

ЖО́ЛУД, аднанасенны плод, часткова або цалкам заключаны ў чашападобную дзеравяністую плюску, якая ўтвараецца са зрослых восей прыкветнікаў рэдукаванага суквецця. Характэрны для раслін сям. букавых: дуба (змяшчае ў плюсцы толькі 1 Ж.), бука і каштана (у плюсцы па 2—3 Ж.). У кожным Ж. адно семя, якое складаецца з *зародка*, 2 мясістых *семядолей* і абалонкі. Мае ў сабе вугляводы (пераважна крухмал), пратэін, дубільныя рэчывы. Выспяваюць восенню. Выкарыстоўваюць як корм для жывёлы, сурагат кавы.

ЖО́ЛУДЗЕЎ Віктар Рыгоравіч (22.3.1905, г. Угліч Яраслаўскай вобл., Расія — 21.7.1944), удзельнік вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў у Вял. Айч. вайну. Ген.-маёр (1942), Ге-



В.Жолтак. Сухія кветкі. 1985.

рой Сав. Саюза (1944). Скончыў камандныя курсы (1929), курсы ўдасканалення каманднага саставу (1930, 1934), курсы Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1940). У Чырв. Арміі з 1921. У Вял. Айч. вайну на Паўд.-Зах, Данскім, Цэнтр., Бранскім, 1-м Бел. франтах. Вызначыўся ў *Беларускай аперацыі 1944*: стралк. корпус пад яго камандаваннем авалодаў г.п. Клічаў, удзельнічаў у вызваленні Мінска. У г. Ваўкавыск каля школы № 1 установлены яго бюст.

ЖО́ЛУДЗЕЎ Навум Ілыч (13.1.1922, г. Гомель — 9.12.1985), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў армейскія курсы парторгаў і камсоргаў (1944), курсы перападрыхтоўкі каманднага саставу (1946), Мінскі юрыд. ін-т (1950). У Чырв. Арміі з 1941. У Вял. Айч. вайну ўдзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Румыніі. Камандзір мінаметнага разліку мал. сяржант Ж. вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра на Пд ад г. Крамянчуг Палтаўскай вобл. (Украіна). Да 1970 у Сав. Арміі.

ЖО́РАЎ Абрам Ілыч (1907, г. Магілёў — 1943), бел. скульптар. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1929). Асн. творы (гіпс) — «Качагар», «Плытагоны», «Лён», «С.Арджанікідзе ў разведцы пад Барысавам» (усе 1930-я г.), праект помніка дукорскім партызанам (1940), «М.Ю.Лермантаў» (барэльеф, 1941). Прымаў удзел у афармленні Дома ўрада ў Мінску (1932—34), бел. павільёна на Усесаюзнай выстаўцы ў Маскве (1939). Загінуў на фронце.

ЖОРЖ (George; сапр. Веймер; Weimer) Маргерыт Жазефін (23.2.1787, г. Баё, Францыя — 11.1.1867), французская актрыса. Вучылася ў драм. актрысы Ракур. У 1802—08, 1813—18 выступала ў т-ры «Камеды Франсэз». Выконвала ролі ў класіцысцкіх трагедыях: Герміёна, Раксана, Клітэмнестра («Андрамаха», «Баязет», «Іфігенія ў Аўлідзе» Ж.Расіна), Клеапатра, Медэя («Радагюна», «Медэя» Б.Карнеля), Меропа, Семіраміда (аднайм. п'есы Вальтэра) і інш. Яе мастацтва адлюстроўвала позні перыяд у развіцці класіцызму з характэрнай для яго знешняй пампезнасцю, дэкаратыўнасцю. З 1822 у т-ры «Адэон», у 1830-я г. — адначасова і ў т-ры «Порт-Сен-Мартэн». У 1849 пакінула сцэну.

ЖОРЖ САНД (George Sand), гл. *Санд* Жорж.

ЖО́РНАЎКА, рака ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., правы прыток р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Даўж. 29 км. Пл. вадазбору 125 км^2. Пачынаецца каля зах. ускраіны в. Жалезкава. Рэчышча каналізаванае ад вытоку на працягу 13 км. Каналізаваны ўчастак наз. Смаляр-ня.

ЖО́РНЫ, прыстасаванне для ручнога памолу зерня; ручны млын. На Беларусі Ж. былі каменныя і драўляныя. Каменныя складаліся з 2 дыскаў дыяметрам 35—50 см, таўшчынёю 10—15 м, пастаўленых у скрынку ці станок. Ніжні нерухомы камень звычайна быў таўсцейшы, верхні — больш лёгкі, з адтулінай пасярэдзіне для засыпання зерня, мацаваўся пры дапамозе паўпрыцы (жалезнай крыжавіны або пласціны), якая круцілася на шпяні, замацаваным у ніжнім камені. Каб мука лепш ссыпалася, паверхню ніжняга каменя рабілі крыху выпуклай, верхняга — увагнутай. Ж. круцілі пры дапамозе доўтага кія (млёна), верхні канец якога ўстаўляўся ў бэльку ці адтуліну спец. планкі. Часам жарнавыя паставы рабілі з дубовых калодак, на рабочую ч. якіх веерападобна набівалі пласцінкі чыгуну або жалеза. Такія Ж. трапляліся пераважна на Палессі. Яшчэ ў пач. 20 ст. Ж. былі амаль у кожнай сял. сям'і, у некаторых месцах ва ўжытку захаваліся да 1950-х г.

Л.І.Мінько.

А.Жораў. С.Арджанікідзе ў разведцы пад Барысавам. 1939.

Жорны драўляныя і каменныя.

ЖО́РСТКАСЦЬ канструкцыі, уласцівасць канструкцыі (цела) супраціўляцца *дэфармацыі*. Залежыць ад геам. характарыстык папярочнага сячэння элементаў канструкцыі і фіз. уласцівасцей матэрыялу (*модуляў пругкасці*).

У абсалютна цвёрдага цела (ідэальны выпадак) Ж. бясконца вялікая, у гумы — вельмі малая. Большасць канструкцыйных матэрыялаў па Ж. займаюць прамежкавае становішча.

Пры простых дэфармацыях у межах *Лука закону* Ж. вызначаецца як здабытак модуля пругкасці на тую ці іншую характарыстыку папярочнага сячэння элемента (плошчу, восевы момант інерцыі і інш.). Паняцце Ж. шырока выкарыстоўваецца пры рашэнні задач *супраціўлення матэрыялаў*. У авіяцыі і ракетнай тэхніцы часта ўлічваюць удзельную Ж. — адносіны Ж. да шчыльнасці матэрыялу. Велічыня, адваротная Ж., наз. *падатлівасцю*.

І.І.Леановіч.

ЖО́РСТКАСЦЬ ВАДЫ́, сукупнасць уласцівасцей прыроднай вады, якія абумоўлены наяўнасцю растваных у ёй

Да арт. **Жостаўская размалёўка.** Н. Ганчарова. Пунцовы свіцянак.

солей кальцыю Ca і магнію Mg. Адрозніваюць карбанатную (часовую, ліквідуюць кіпячэннем) і некарбанатную (пастаянную), якія разам складаюць агульную Ж.в. (сума канцэнтрацый катыёнаў Ca^{2+} і Mg^{2+}).

Карбанатная Ж.в. выклікана прысутнасцю *гідракарбанатаў*, некарбанатная — сульфатаў, хларыдаў, сілікатаў, нітратаў, фасфатаў кальцыю і магнію. Выкарыстанне жорсткай вады прыводзіць да ўтварэння накіпу ў паравых катлах, абагравальных прыладах, павялічвае расход мыла пры мыцці, ускладняе варку агародніны і мяса. Памяншаюць Ж.в. вапнава-содавым метадам (дабаўленне вапны і соды) ці іонаабменнымі метадамі (гл. *Іаніты*).

ЖО́СТАЎСКАЯ РАЗМАЛЁЎКА, рускі народны маст. промысел, развіты ў в. Жостава Мыціщінскага р-на Маскоўскай вобл. Узнікла ў пач. 19 ст. пераважна пад уплывам уральскай кветкавай размалёўкі па метале. Яе развіццё стылістычна ўзаемазвязана з размалёўкай па фарфоры і фініфці падмаскоўных з-даў і ф-к, кветкавымі матывамі набіванага паркалю ф-к г. Іванава і *фядоскінскай мініяцюрай*. Ж.р. — дэкар. жывапіс (пераважна выявы букетаў, садавіны) на метал. падносах з наступным пакрыццём лакам. Выконваецца энер-

гічным мазком стракатымі алейнымі фарбамі на чорным або каляровым фоне. У 1928 заснавана арцель (цяпер Жостаўская ф-ка дэкар. размалёўкі).

Літ.: Коромыслов Б.И. Жостовская роспись. М., 1977.

ЖОЎТАГАЛО́ВЫ КАРАЛЁК (Regulus regulus), птушка сям. каральковых атр. вераб'інападобных. Пашыраны ў Еўразіі. Жыве пераважна ў яловых лясах. Увосень і зімой вандруе ў мяшаных і лісцевых насаджэннях. На Беларусі трапляецца па ўсёй тэрыторыі. Аселы і вандроўны від.

Самая маленькая птушка Беларусі, вядомая пад назвай «еўрап. калібры». Даўж. цела 9—11 см, маса 5—7 г. Апярэнне мяккае, пушыстае. Спіна шаравата-зялёная, брушка светла-шэрае, хвост цёмна-буры, на крылах па 2 белыя палоскі, на галаве жаўтавата-аранжавы чубок з цёмнымі падоўжанымі палоскамі па баках. Гнёзды пераважна на елках. Корміцца насякомымі і іх лічынкамі.

Жоўтагаловы каралёк.

ЖО́ЎТАЕ МО́РА, кіт. Хуанхай, паўзамкнёнае мора Ціхага ак., каля ўсх. берагоў Азіі, паміж п-вам Карэя і берагамі Кітая. Пл. 417 тыс. км^2. Найб. глыб. 106 м, сярэдняя 40 м. Буйнейшыя залівы: Бахайвань, Ляадунскі і Зах.-Карэйскі. У Ж.м. ўпадаюць р. Хуанхэ, Хайхэ, Ляахэ, Ялуцзян. Клімат умераны, мусонны. Сярэдняя т-ра вады на паверхні: ніжэй 0 на ПнЗ і 6—8 °С (люты) на Пд; ад 24 на Пн да 28 °С на Пд (жнівень). Паўн.-зах. ч. Ж.м. з ліст. да сак. замярзае. Салёнасць ад 30‰ і менш на ПнЗ да 33—34‰ на ПдУ. Прылівы паўсутачныя, каля берагоў Карэі да 9 м, у інш. раёнах да 3—4 м. У Ж.м. водзяцца селядзец, марскі лешч, траска, вугор, міды, вустрыцы. Найб. парты ў Кітаі — Цяньцзінь, Інкоў, Цындао, Далянь (Дальні), Люйшунь (Порт-Артур), у Карэі — Інчхон (Чэмульпо).

ЖО́ЎТА-ЗЯЛЁНЫЯ ВО́ДАРАСЦІ, разнажгуцікавыя водарасці (Xanthophyta, Heterocontae), аддзел ніжэйшых раслін. Вядома каля 560 відаў і ўнутрывідавых таксонаў. Пашыраны па ўсім зямным шары пераважна ў прэсных, некаторыя — у салёных вадаёмах і глебе. Планктонныя арганізмы, радзей бентасныя. На Беларусі адзначана больш за 50 відаў з 22 родаў: арахнахлорыс, афіяцытыум, батрыдыум, батрыдыёпсіс, вашэрыя, гетэротрыкс, гетэракокус, манодус плеўрахлорыс, трыбанема, тэтраэдрыела, харацыёпсіс і інш.

Аднаклетачныя, шматклетачныя, радзей каланіяльныя і цэнабіяльныя арганізмы разнастайнай формы. Рухомыя, плавающь пасіўна або прымацаваныя. Колер ад светла- да цёмна-жоўта-зялёнага, рэдка зялёны або блакітны з-за наяўнасці ў хларапластах, акрамя хларафілу, вял. колькасці жоўтых пігментаў (ксантафілы, караціны). Клеткі адна-, радзей шматядравыя з абалонкай, радзей голыя. Крухмал, як запасное рэчыва, адсутнічае (характэрная прыкмета). Жыўленне пераважна аўтатрофнае. Размнажэнне вегетатыўнае, бясполае (зааспорамі, аўтаспорамі і інш.), рэдка палавае (іза- і аагамія). Аднаклетачныя рухомыя віды і зааспоры маюць 2 жгуцікі рознай даўжыні (адсюль другая назва).

ЖО́ЎТАЯ АКА́ЦЫЯ, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Карагана*.

ЖО́ЎТАЯ ВАДЗЯНА́Я ЛІЛЕ́Я, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Гарлачык жоўты*.

ЖО́ЎТАЯ КРЫВЯ́НАЯ СОЛЬ, калію гексацыянаферату (II) трыгідрат, $K_4[Fe(CN)_6]\cdot 3H_2O$, гл. ў арт. *Калію злучэнні*.

ЖО́ЎТАЯ ЛІХАМА́НКА, вострая інфекц. хвароба чалавека з сімптомамі інтаксікацыі, гемарагічным сіндромам, жаўтухай. Выклікаецца вірусам, перадаецца камарамі роду Aëdes. Пашырана ў Паўд. Амерыцы і Зах. Афрыцы.

Інкубацыйны перыяд 3—6 (да 12) дзён, пасля паяўляецца ліхаманка, т-ра цела павышаецца да 39—40 °С, баляць галава і мышцы, пашкоджваюцца ныркі, печань (жаўтуха), крывяносныя сасуды (кровазліццё пад скуру і ва ўнутр. органы, ірвота з крывёю). Пасля хваробы застаецца імунітэт на 6—10 гадоў. Лячэнне сімптаматычнае.

ЖО́ЎТАЯ РАКА́, у Кітаі, гл. *Хуанхэ*.

ЖО́ЎТЫ ПАВІ́ЯН, гл. *Бабуін*.

«ЖО́ЎТЫХ ПАВЯ́ЗАК» ПАЎСТА́ННЕ, сялянскае паўстанне ў Стараж. Кітаі ў 184—204. Назва ад жоўтых павязак, якія паўстанцы насілі на галаве. Адзін з кіраўнікоў паўстання — Чжан Цзяо, ураджэнец Цзюйлу (прав. Хэбэй), які на працягу 10 гадоў аб'ядноўваў сялян на аснове прапаганды містычнага даоскага вучэння «пра шлях вялікай роўнасці». Паўстанцы былі арганізаваны ў 36 вял. (больш за 10 тыс. чал.) і малых (па 6—7 тыс. чал.) атрадаў (фан). Супраць іх выступілі войскі імператара і буйных землеўладальнікаў, якія ліквідавалі паўстанне; Чжан Цзяо загінуў. У хуткім часе ў прав. Хэбэй зноў паўсталі сяляне, якія ўтварылі «Армію чорных гор» (больш за 1 млн. чал.). Пазней паўстанне канчаткова ліквідавана сіламі военачальнікаў Юань Шао, Цао Цао і інш.

Літ.: Очерки истории Китая: С древности до «опиумных войн»: Пер. с кит. М., 1959.

Дз.М.Чаркасаў.

ЖО́ЎТЫЯ ВО́ДЫ, горад на Украіне, у Днепрапятроўскай вобл., на р. Жоўтая. 63,9 тыс. ж. (1991). Чыг. ст. Прам-сць: горна-здабыўная (жал. руда), прыладабуд. (з-д «Электрон», Паўд. радыёзавод), лёгкая (ф-ка штучнага футра) і харчовая. Засн. ў канцы 19 ст., горад з 1957. Месца бітвы ўкр. войска Б.*Хмяльніцкага* з авангардам войск Рэчы Паспалітай (1648).

ЖО́ЎЦЕВЫ ГРЫБ, воўчы грыб (Tylopilus felleus), шапкавы базідыяльны грыб сям. балетавых. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі расце ў лясах. Вельмі падобны да баравіка, адрозніваецца ружовым колерам гіменафора і горкім смакам мякаці. Неядомы, можа выклікаць атручэнне. Выкарыстоўваецца як жаўцягонны сродак (адсюль назва).

Шапка дыям. 3—8 см, пукатая, сухая, бураватая або бурая. Мякаць мяккая, белая, на зломе ружовая, без асаблівага паху. Гіменафор прыросласа або выемчаты, трубачкі белыя, потым брудна-шаравата-ружовыя. Ножка падоўжана-клубнепадобная або цыліндрычная, суцэльная, уверсе з яўна бачным чорна-бурым сеткавым малюнкам. Споры верацёнападобнападоўжаныя, гладкія, светла-ружавата-бураватыя.

Жоўцевы грыб.

ЖО́ЎЦЕВЫ ПУЗЫ́Р, полы орган стрававальнай сістэмы большасці пазваночных жывёл і чалавека, у якім адбываецца збіранне і канцэнтрацыя *жоўці*. Размешчаны на ніжняй паверхні правай долі *печані*. Адсутнічае ў міног, некат. рыб, птушак (галубы, зязюлі, калібры, папугаі, страусы, туканы), млекакормячых (кітападобныя, сланы, алені, вярблюды, няпарнакапытныя, многія мышападобныя грызуны).

Форма грушападобная, радзей канічная. Мае дно, цела і шыйку, якая пераходзіць у пузырную пратоку, што злучана з пячоначнай пратокай і ўтварае агульную жоўцевую пратоку. У чалавека ёмістасць Ж.п. 30—70 см^3, даўж. 10—14 см, шыр. 3,5—4 см. Сценка Ж.п. таўшч. 1,5—2 мм складаецца са слізістай і мышачнай абалонак, ніжняя паверхня ўкрыта брушынай. Пры перыяд. скарачэнні мускулатуры сценак Ж.п. жоўць паступае ў агульную жоўцевую пратоку і дванаццаціперсную кішку, дзе ўдзельнічае ў працэсах стрававання. Ж.п. рэгулюе і падтрымлівае на пастаянным узроўні ціск жоўці ў жоўцевых шляхах. Паталогіі Ж.п.: заганы развіцця, пашкоджанні, функцыян. парушэнні, захворванні (запаленне — халецыстыт, *жоўцекамянёвая хвароба*), пухліны Лячэнне — кансерватыўнае і аператыўнае.

А.С.Леанцюк.

ЖО́ЎЦЕВЫЯ КІСЛО́ТЫ, высокамалекулярныя монакарбонавыя поліцыкліч-

ныя кіслоты з класа стэрынаў, вытворныя халанавай к-ты. Утвараюцца ў клетках печані чалавека і многіх жывёльных арганізмаў і выдзяляюцца з жоўцю.

Да Ж.к. належаць холевая, дэзоксіхолевая, літахолевая і інш. к-ты. Асн. частка іх у жоўці злучаецца з глікаколам і таўрынам і ўтварае т. зв. парныя Ж.к. (напр., глікахолевыя к-ты), солі якіх садзейнічаюць эмульгаванню і перапрацоўцы тлушчаў, усмоктванню тлустых к-т. Ж.к., што атрымліваюць з жоўці выпэйшых жывёл, выкарыстоўваюцца ў фармацэўтычнай прам-сці як сыравіна для вытв-сці палавых гармонаў і інш.

ЖО́ЎЦЕВЫЯ ПІГМЕ́НТЫ, азоцістыя прадукты распаду *гемаглабіну* і інш. гемазмяшчальных рэчываў, якія ўваходзяць у склад *жоўці* і надаюць ёй характэрную афарбоўку. Па хім. будове — лінейныя гетэрапірольныя злучэнні з рознай колькасцю і лакалізацыяй падвойных сувязей і замяшчальнікаў. У чалавека і жывёл утвараюцца пераважна ў печані, выдзяляюцца ў выглядзе *білірубіну* і *білівердзіну*, выводзяцца з арганізма з калам і мачой. Пры некат. відах паталогіі (жаўтуха, гемалітычная хвароба нованароджаных і інш.) назапашваюцца ў асобных тканках і органах, служаць іх дыягнастычнай прыкметай.

ЖОЎЦЕКАМЯНЁВАЯ ХВАРО́БА, захворванне, абумоўленае ўтварэннем камянёў у жоўцевым пузыры і (або) жоўцевых пратоках. Частата ўтварэння жоўцевых камянёў павялічваецца з узростам і дасягае 50% у жанчын старэй за 80 гадоў. У мужчын жоўцевыя камяні трапляюцца ў 3—5 разоў радзей, у дзяцей — вельмі рэдка. Асн. прычыны ўзнікнення Ж.х.: застой жоўці, запаленне жоўцевага пузыра і жоўцевых шляхоў, змяненне хім. саставу жоўці ў сувязі з парушэннямі абмену рэчываў (спадчынная схільнасць). Жоўцевыя камяні (халеліты) — цвёрдыя ўтварэнні, колькасць якіх можа складаць ад аднаго да некалькіх тысяч, велічыня — да некалькіх сантыметраў у дыяметры, маса — да 30 г і болей. Асн. праяўленне захворвання — болі ў правым падрабрынні, якія ўзнікаюць пасля ежы, асабліва вострай або тлустай. Часта назіраюцца слабасць, недамаганне, раздражняльнасць, горкая адрыжка, няўстойлівы стул. Ускладненні Ж.х.: флегмона, гангрэна, вадзянка, эмпіэма і перфарацыя жоўцевага пузыра, жоўцевы перытаніт, самаадвольны жоўцевы свішч. Лячэнне тэрапеўтычнае, бальнеалагічнае, хірургічнае.

ЖО́ЎЦЬ, вадкі сакрэт жаўтавата-карычневага колеру, які бесперапынна выпрацоўваецца жалезістымі клеткамі (гепатацытамі) печані пазваночных жывёл і чалавека. Ж. эмульгуе тлушчы, павялічвае ўсмоктванне прадуктаў гідролізу тлушчаў, павышае актыўнасць панкрэатычных і кішачных ферментаў, рэгулюе маторную і сакраторную дзейнасць страўніка і тонкага кішэчніка, валодае бактэрыяльна-статыстычнымі ўласцівасцямі, удзельнічае ва ўсмоктванні са страўніка тлушчарастваральных вітамінаў, халестэрыну, амінакіслот і солей кальцыю, інактывуе пепсін страўнікавага соку. Адрозніваюць пячоначную Ж., якая выдзяляецца непасрэдна ў кішэчнік незалежна ад стрававання (злёгку вязкая залаціста-жоўтая), і пузырную Ж., што збіраецца ў жоўцевым пузыры (вязкая жоўта-бурая або зялёная) і трапляе ў кішэчнік, калі там ёсць ежа. Ж. мае ў сабе ваду, солі жоўцевых кіслот, жоўцевыя пігменты, халестэрын, неарган. солі і інш. біялагічна актыўныя рэчывы: гармоны — тыраксін, ферменты — фасфатазы, таксама вітаміны, фосфаліпіды і інш. Печань даросłага чалавека выдзяляе за суткі да 2 л Ж., буйн. раг. жывёлы — да 9,5 л. Прэпараты Ж. выкарыстоўваюцца ў медыцыне.

А.С.Леанцюк.

ЖО́ХАЎ Уладзімір Паўлавіч (н. 8.2.1933, С.-Пецярбург), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыў Ленінградскае вышэйшае маст.-прамысл. вучылішча (1960). У 1967—95 мастак шклозавода «Нёман». Працуе ў галіне маст. шкла. У творчасці выкарыстоўвае прыём гіпербалізацыі форм, аб'ёмаў, асацыятыўную вобразнасць спалучае з дызайнерскімі рашэннямі: дэкар. кампазіцыі «Белавежская пушча» (1969), «Кветкі» (залаты медаль на міжнар. выстаўцы шкла і фарфору 1973 у г. Ябланец, Чэхія), «Шкляныя метамарфозы» (1973), «Птушкі» (1980), «Акулы» (1983), «Сёння на світанні» (1984), «Венерыны чаравічкі» (1993); камплекты посуду «Мядзведзі» (1967), «Марыя Сцюарт» (1993), дробная пластыка «Пеўні» (1972), «Дэльфіны» (1977); блюда «Дуб» (1974), куфаль з партрэтам У.С.Высоцкага (1990) і інш. Аўтар вітражоў-карцін «Пётр I», «Карэта» (абедзве 1973). Іл. гл. таксама да арт. *Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*

У.Жохаў. Кветкі. 1973.

ЖРЭ́ЦТВА (ад стараслав. жрьти — прынесці ў ахвяру), грамадская група, якая займалася выкананнем рэліг. культаў у стараж. рэлігіях (ахвярапрынашэнні, малітвы і г.д.). Складала вузка карпаратыўную касту, валодала багаццем і вял. уладай, у т.л. палітычнай. Члены касты (жрацы) павінны былі строга выконваць прадпісаныя ім адпаведныя правілы паводзін і заставацца «валадарамі» сіл прыроды; пры першых жа прыкметах слабасці цара-жраца ўмярцвялі, яго месца займаў маладзейшы. Ж. было цесна звязана з ін-там дзяржв. улады і складала яго неад'емнае арганічнае звяно. Напр., *брахманы*, якія паходжаннем належалі да старажытнейшага саслоўя жрацоў, былі на працягу многіх стагоддзяў адной з самых высокіх кастаў у інд. грамадстве, валодалі зямлёй, вырашалі дзярж. пытанні. У адрозненне ад Стараж. Індыі ў Стараж. Грэцыі і Стараж. Рыме Ж. не было замкнёным, вузка карпаратыўным саслоўем і не адыгрывала такой значнай ролі ў паліт. жыцці дзяржавы. У Грэцыі жрацоў і жрыц выбіралі на нар. сходах. Толькі ў Дэльфах, пры храме Апалона, існавала калегія жрацоў. Своеасаблівую арганізаваную супольнасць складалі і жрацы бога *Асклепія*, асн. абавязкам якіх было лячэнне хворых у асклепіях (свяцілішчах). Паводле Плутарха, пасада вярх. жраца (пантыфіка) у Рыме была ўстаноўлена царом Нумам Пампіліем. Вярхоўнага жраца выбіралі грамадзяне Рыма, ім мог стаць кожны свабодны грамадзянін. Вярх. жрэц узначальваў калегію пантыфікаў (гл. *Пантыфікат*), куды ўваходзілі вышэйшы жрэц (свяшчэнны цар), які ведаў ахвярапрынашэннямі, і тры старэйшыя *фламіны* (жрацы Юпітэра, Марса і Квірына). Старэйшых фламінаў таксама выбіралі з прадстаўнікоў знатных патрыцыянскіх родаў. Малодшыя фламіны, якімі маглі стаць і выхадцы з плебсу, у калегію пантыфікаў не ўваходзілі. Вярх. пантыфік узносіў малітвы, кіраваў урачыстымі ахвярапрынашэннямі. Яго памочнікамі былі жрыцы багіні *Весты* (вясталкі). У Кітаі Ж. (даосы) не адыгрывала вядучай ролі ў паліт. жыцці дзяржавы. Гэтую ролю выконваў культ *канфуцыянства*. З паяўленнем монатэістычных рэлігій (хрысціянства, ісламу, ламаізму і інш.) Ж. як сац. ін-т знікла і на змену яму прыйшло *духавенства*. На Беларусі былі шырока распаўсюджаны абрады ахвярапрынашэння, але Ж. як самастойнага ін-та не існавала. Захавалася ў некат. народаў Афрыкі, Паўд. Амерыкі, Акіяніі.

Літ.: Винничук Л. Люди, нравы и обычаи Древней Греции и Рима Пер с пол. М., 1988; Фрэзер Дж. Дж. Золотая ветвь: Исслед. магии и религии: [Пер. с англ.]. М., 1980.

Т.І.Адула.

ЖУА́Н-ПЕСО́А (João Pessoa), горад на ПдУ Бразіліі, на р. Параіба. Адм. ц. штата Параіба. Засн. ў 1585 пад назвай Параіба. Каля 400 тыс. ж. (1995). Вузел чыгунак і аўтадарог, пачатак *Трансамазонскай шашы*. Порт у вусці р. Параіба

даступны для марскіх суднаў. Аэрапорт. Прам-сць: буд. матэрыялаў, тэкст., харчовая. Ун-т. Арх. помнікі 18 ст.

ЖУБА́НАВА Газіза Ахметаўна (н. 2.12.1927, урочышча Касуактам Акцюбінскай вобл., Казахстан), казахскі кампазітар. Нар. арт. Казахстана (1973), нар. арт. СССР (1981). Скончыла Маск. кансерваторыю (1954, клас Ю.*Шапорына*). З 1966 выкладае ў Алма-Ацінскай кансерваторыі (з 1978 праф., у 1975—87 яе рэктар). Сярод твораў: оперы «Енлік і Кебек» (1975), «Дваццаць восем» (1981), «Курмангазы» (разам з бацькам А.Жубанавым, 1987), балет «Легенда пра белую птушку» (1966); араторыі «Зара над стэпам» (1960), «Аральская быль» (1978), «Пісьмо Таццяны» (1983), «Палюбі чалавек чалавека» (1988); кантаты; сімфоніі «Жыгер» (1973), «Востраў Жанчын» (1983), сімф. паэмы (1954, 1965); канцэрты для фп. (1986) і скрыпкі (1958) з арк.; камерна-інстр. творы; музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Дзярж. прэмія Казахстана 1970.

ЖУ́ВІНТАС, запаведнік у Алітускім р-не Літвы, у вярхоўях левага прытока р. Нямунас — Шашупе. Засн. ў 1946 для аховы месцаў пражывання вадаплаўных птушак, рэліктавых і рэдкіх раслін. Пл. 5428 га (1032 га займае воз. Жувінтас, якое знаходзіцца ў запаведным рэжыме з 1937). Тыповыя ландшафты паўд.-зах. Літвы маюць у наяўнасці вярховыя і нізінныя балоты (каля 2900 га агульнай пл.), лясы (каля 1200 га) і лугі (каля 70 га). Флора ўключае 613 відаў вышэйшых раслін, з якіх 39 ахоўныя. У арнітафауне запаведніка ўлічана каля 250 відаў птушак, з якіх 139 гняздоўныя. Найб. каштоўны — натуральна акліматызаваны лебедзь-шыпун. Тэрыяфауна прадстаўлена 35 відамі: да фонавых належаць дзік, казуля, лось, характэрныя віды — заяц-русак, вавёрка звычайная, ліс, янотападобны сабака, барсук, лясная куніца, рачная выдра. У іхтыяфауне возера сярод 20 відаў рыб найб. шматлікі шчупак, звычайны лінь, краснапёрка, плотка, лешч.

ЖУВЭ́ (Jouvet) Луі (24.12.1887, г. Кразон, Францыя — 16.8.1951), французскі рэжысёр, акцёр, педагог. Праф. (1934). Сцэн. дзейнасць пачаў у «Тэатр дэз Ар» (1911). Працаваў у т-рах «В'ё каламб'е» (з 1913), «Камедыя Елісейскіх палёў» (з 1922, з 1924 і кіраўнік), «Атэней» (з 1934). Сярод лепшых роляў: Кнок («Кнок» Ж.Рамэна), Дон Жуан, Тарцюф (аднайм. п'есы Мальера), Меркурый, Гектар («Амфітрыён 38», «Траянскай вайны не будзе» Ж.Жыраду). Ставіў п'есы тагачасных драматургаў, у якіх узнімаў актуальныя тэмы жыцця грамадства. З 1932 здымаўся ў кіно. Сярод фільмаў: «Гераічная кермеса», «На дне», «Паўночны атэль» і інш.

ЖУДРО́ Васіль Сцяпанавіч (1917, в. Карані Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. — 20.4.1942), адзін з кіраўнікоў *Мінскага патрыятычнага падполля* ў Вял. Айч. вайну. У 1941 вучыўся на курсах у Мінску. У пач. акупацыі горада ўстанавіў сувязь з падп. групай у раёне Камароўкі і партыз. групай «Дзядзькі Васі» (В.Т.Варанянскага). Арганізаваў вывад да партызан групы людзей, адпраўку зброі і боепрыпасаў. Са снеж. 1941 чл. Мінскага падп. гаркома КП(б)Б. Удзельнічаў у правядзенні дыверсій на аўтамагістралях каля горада. 17.4.1942 цяжка паранены, памёр ад ран.

В.С.Жудро.

А.Жук.

ЖУДЫ́К (Judic) Ганна [сапр. Д а м ' е н (Damiens) Ганна Марыя Луіза; 17.7.1850, г. Семюр, Францыя — 15.4.1911], французская артыстка аперэты, эстр. спявачка. Вучылася ў Парыжскай кансерваторыі. З 1867 выступала ў парыжскіх т-рах, з 1872 — у «Буф-Парызьен» (па запрашэнні Ж.Афенбаха), з 1876 у «Вар'етэ». Яе творчасці былі ўласцівы дасканалае вак. майстэрства, лёгкасць і віртуознасць камедыйнай тэхнікі. Сярод партый: Алена, Герцагіня («Прыгожая Алена», «Герцагіня Геральштэйнская» Афенбаха), Дэніза («Мадэмуазель Нітуш» Ф.Эрвэ). Як эстр. спявачка стварыла ўласны стыль выканання, заснаваны на гранічнай выразнасці жэста.

ЖУЖА́ЛА (Bombyliidae), сямейства насякомых падатр. каратказусых прамашыўных атр. двухкрылых. Больш за 4 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў сухіх тропіках і субтропіках. Асобныя віды трапляюцца на Пд Карэльскага перашыйка і каля г. Якуцк, у гарах на выш. да 4500 м. Мухі жывуць пераважна на кветках, на адкрытых сонечных прасторах. На Беларусі каля 30 відаў, найб. трапляюцца Ж. вялікі (Bombylius major), разнаколерны (B. discolor) і жаласніца чорная (Anthrax morio).

Даўж. 0,8—30 мм. Цела з шырокім кароткім брушкам, укрытае густымі валаскамі або лусачкамі, стракатае з метал. бляскам. У многіх доўгі хабаток. Крылы празрыстыя, стракатыя. Развіццё большасці Ж. з гіперметамарфозам; лічынкі рухомыя, паразіты розных насякомых. Дарослыя добра лётаюць, харчуюцца нектарам.

Жужала: 1 — вялікі; 2 — разнаколерны.

ЖУ́ЖАЛІ (Carabidae), сямейства насякомых атр. жукоў. Каля 25 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ва ўмераным поясе Еўразіі. Жывуць у лясным подсціле і на яго паверхні, радзей на дрэвах, у мурашніках і інш. На Беларусі больш за 300 відаў, з іх 12 занесены ў Чырв. кнігу: рашэцісты (Carabus cancellatus), Менетрые (C. menetriesi), бліскучы, або нітэнс (C. nitens), фіялетавы (C. violaceus), шчыгрынавы (C. coriaceus), цудоўны (C. scheidleri), блытаны (інтрыкатус — C. intricatus), абляманы (C. marginalis), красацелы — бронзавы (малы — Calosoma inqisitor), пахучы (C. sycophanta), даследчык, або чорны (C. investigator), скакун пясчаны (арэнарыя — Cicindela arenaria).

Даўж. 1,2—90 мм. Цела звычайна прадаўгаватае, вусікі пераважна нітказападобныя, ногі доўгія, бегальныя. Галава круглая. Надкрылы часта зрастаюцца, крылы бываюць недаразвітыя. Афарбоўка часцей чорная, бурая, з метал. бляскам розных адценняў, радзей стракатая. У многіх відаў развіты анальныя залозы, якія выдзяляюць едкую вадкасць. Жывуць і акукліваюцца ў глебе. Лічынкі прадаўгаватыя, рухомыя. Большасць Ж. — мнагаедныя драпежнікі, кормяцца глебавымі беспазваночнымі — насякомымі, іх лічынкамі, малюскамі, дажджавымі чарвякамі. Многія кормяцца жывёльным і раслінным кормам, радзей — раслінаедныя (збожжавая, прасяная і інш.).

ЖУ́ЖАЛЬЦЫ (halterium), парныя булавападобныя або колбападобныя мініяцюрныя органы двухкрылых, самцоў веераакрылых і чарвяцоў. Уяўляюць сабой відазмененыя крылы — заднія ў двухкрылых і чарвяцоў або пярэднія ў веераакрылых. Аснова і галоўка Ж. маюць вял. колькасць органаў пачуццяў — *сэнсіл* (напр., у сляпнёў іх 565). Іх вял. колькасць у насякомых, якія добра лётаюць. У палёце Ж. вагаюцца (б'юць) з той жа частатой, што і крылы, але ў процілеглай фазе, і функцыянуюць як гіраскоп. Выдаленне Ж. (у эксперыменце) у мух парушае стабілізацыю палёту.

ЖУЖУ́Й (Jujuy), С а н - С а л ь в а д о р - д э - Ж у ж у й, горад на Пн З Аргенціны, на р. Рыо-Грандэ-дэ-Жужуй (бас. Параны). Адм. ц. прав. Жужуй. Засн. ў 1593. Каля 300 тыс. ж. (1995). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гандл. цэнтр с.-г., горна-здабыўнога (свінец, цынк) і лесапрамысл. раёна. Харч. і лесапільныя прадпрыемствы.

ЖУІС-ДЫ-ФО́РА (Juiz de Fora), горад на ПдУ Бразіліі, у штаце Мінас-Жэрайс. Засн. ў 1709. Каля 450 тыс. ж. (1995). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Гандл. цэнтр с.-г. раёна.

Жужалі: 1 — рашэцісты; 2 — Менетрые; 3 — бліскучы; 4 — фіялетавы; 5 — шчыгрынавы; 6 — цудоўны; 7 — блытаны; 8 — аблямаваны. Красацелы: 9 — бронзавы; 10 — даследчык; 11 — пахучы; 12 — скакун пясчаны.

Прам-сць: трыкат., маш.-буд., цукр., піваварная, гарбарна-абутковая. ГЭС на р. Параібуна. Ун-т.

ЖУЙКО́Ў Мікалай Пятровіч (снеж. 1922, пас. Ялоўскі Ярскага р-на Удмурцкай Рэспублікі — 1.3.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Камандзір асобнага кулямётнага артыл. батальёна лейтэнант Ж. у баі за вышыню каля в. Мормаль Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. ў рашаючы момант закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота. Калі праціўнік зноў адкрыў агонь, ст. сяржант П.М.Мазілін паўтарыў подзвіг Ж., і батальён авалодаў вышынёй. У в. Мормаль на месцы іх подзвігу пастаўлены помнік.

ЖУК, балота ў цэнтр. ч. Пінскага р-на Брэсцкай вобл., у пойме р. Ясельда. Нізіннага тыпу. Пл. 6,6 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 3,6 тыс. га. Глыб. торфу да 4 м, сярэдняя 1,1 м. Большая ч. балота асушана, пад ворывам і сенажаццю. На неасвоеных участках хмызняк з вольхі і бярозы, асака, сітнік, трыснёг і чарот.

ЖУК Алесь (Аляксандр Аляксандравіч; н. 1.4.1948, в. Клешаў Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1970). Працаваў у выд-ве «Мастацкая літаратура», час. «Маладосць», у апараце ЦК КПБ, гал. рэд. газ. «Літаратура і мастацтва», у час. «Полымя». З 1997 гал. рэд. час. «Нёман». Друкуецца з 1965. Аўтар кніг прозы «Асеннія халады» (1972), «Паляванне на старых азёрах» (1975), «Зоркі над палігонам» (1977, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1978), «Не забывай мяне» (1978), «Па саннай дарозе» (1979), «Паўстанак вяртання» (1981, Літ. прэмія імя І.Мележа 1982), «Паляванне на Апошняга Жураўля» (1982), «Чорны павой» (1986), «На дазорнай сцяжыне» (1990), «Помста матылькоў» (1991), «Праклятая любоў» (1991, Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1992). Раскрывае праблемы сучаснасці ва ўсёй іх вастрыні і складанасці. Творы Ж. адметныя апісаннем багатага спектра чалавечых характараў і ўзаемаадносін, роздумам над пытаннямі жыцця і лёсу, неспакоем за стан навакольнага асяроддзя, лірычна-спавядальнай манерай перадачы некаторых аўтабіяграф. фактаў, выкарыстаннем міфічна-казачнай сімволікі. На бел. мову пераклаў аповесці і апавяданні М.Кацюбінскага, А.Упіта, Г.Траяпольскага, В.Астаф'ева і інш., раманы Ж.Жубера, Н.Сафарава, Т.Джумагельдыева, раман М.Булгакава «Майстар і Маргарыта» (1994).

Тв.: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1993—94.

А.А.Пашкевіч.

ЖУК Аляксандр Апанасавіч (31.12.1918, в. Вёска Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 18.7.1983), Герой Сав. Саюза (1945), ген.-маёр (1957). Скончыў Мінскае ваен. пях. вучылішча (1937), курсы «Выстрал» (1942), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1948). У Чырв. Арміі з 1934. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Зах., Калінінскім, Данскім, Бранскім, Цэнтр., 1-м Укр., 1-м і 2-м Бел. франтах. Камандзір стралк. палка падпалкоўнік Ж. вызначыўся ў 1945 у баях на р. Одэр. Да 1959 у Сав. Арміі.

ЖУК Анатоль Аляксандравіч (н. 20.5.1949, в. Ярэмічы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1997). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). Працаваў у Магілёўскім абл. т-ры драмы і камедыі (Бабруйск). З 1975 у Т-ры юнага гледача Беларусі. Выконвае камедыйныя і востраха-рактарныя ролі. Сярод іх: Важак («Бэмбі» паводле Ф.Зальтэна, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1980), Каваль («Рыгорка — ясная зорка» А.Вярцінскага), Білі Бонс («Востраў скарбаў» паводле Р.Стывенсана), Заслонаў («Паядынак» М.Матукоўскага), Міканор («Подых навальніцы» паводле І.Мележа), Чалавек у чорным («Выбар» А.Дударава), Трыгорын («Чайка» А.Чэхава), Хорыя («Імем зямлі і сонца» І.Друцэ), Фабіян («Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра). Здымаецца ў тэлепастаноўках.

ЖУК Вадзім Дзмітрыевіч (н. 20.5.1952, г.п. Мір Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. спартыўны і грамадскі дзеяч. Суддзя міжнар. катэгорыі па футболе (1988), віцэ-прэзідэнт Бел. федэрацыі футбола (1994). Скончыў Бел. ун-т (1980) і Бел. ін-т фіз. культуры (1985). Судзіў 1-ы чэмпіянат свету па футболе сярод жан. каманд (1991; Кітай), фінальныя гульні чэмпіянатаў Еўропы па футболе ў Швецыі (1992) і Вялікабрытаніі (1996).

ЖУК Валерый Іванавіч (н. 25.7.1949, в. Паўстынь Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. мастацтвазнавец. Канд. мастацтвазнаўства (1985). Скончыў Маскоўскі ун-т (1973). У 1973—76 выкладчык Грозаўскай школы-інтэрната (Капыльскі р-н Мінскай вобл.). З 1976 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі (з 1992 вучоны сакратар). Даследуе дэкар.-прыкладное мастацтва. Аўтар кніг: «Сучасная беларуская кераміка. Тэндэнцыі развіцця» (1984), «Традыцыі і наватарства ў беларускім савецкім дэкаратыўна-прыкладным мастацтве» (1985) і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1996 (за ўдзел у выданні «Гісторыі беларускага мастацтва», т. 1—6, 1987—94).

Н.В.Грэская.

ЖУК Іван Васілевіч (н. 18.3.1954, в. Паўстынь Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1996). Скончыў БПІ (1976). З 1976 у Ін-це надзейнасці машын Нац. АН Беларусі. Навук. працы па праектаванні, вырабе і павышэнні даўгавечнасці зубчастых перадач і перадатачных механізмаў на іх аснове. Распрацаваў тэарэт. асновы выбару і разліку геаметрыі зубчастых колаў нестандартнага зыходнага контуру.

Тв.: Зубчатые передачи с повышенной податливостью зубьев. Мн., 1993 (разам з А.В.Берасневым, А.М.Нядзелькіным).

ЖУК Кастусь (Канстанцін Якаўлевіч, н. 2.5.1954, в. Затур'я Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1981). Працаваў у прэсе, на Бел. тэлебачанні, з 1988 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Друкуецца з 1968. Паэзія вылучаецца праблемнай насычанасцю, эмацыянальнасцю, імкненнем да афарыстычнасці, філас. абагульнення жыццёвых з'яў, роздумам над лёсам зямлі (зб-кі «Планета маёй душы», 1982, «Зямная ноша», 1988, «У найме ў сонца» і «Пладаносны агонь», абодва 1991, «Галгофа», 1997).

С.Я.Жук.

ЖУК Сяргей Якаўлевіч (4.4.1892, Кіеў — 1.3.1957), савецкі вучоны ў галіне гідратэхнікі; адзін з заснавальнікаў школы сав. гідратэхнікаў. Акад. АН СССР (1953), ген.-маёр інж.-тэхн. службы (1943), Герой Сац. Працы (1952). Скончыў Петраградскі ін-т інжынераў шляхоў зносін (1917). З 1942 дырэктар ін-та «Гідрапраект» (з 1957 імя Ж.). Кіраваў вышукальнымі і н.-д. работамі, праектаваннем і буд-вам Беламорска-Балтыйскага канала імя Масквы, Волга-Данскога комплексу, Волга-Балтыйскага воднага шляху, Угліцкай, Рыбінскай, Волжскай імя У.І.Леніна і інш. ГЭС на Волзе. Дзярж. прэміі СССР 1950, 1951.

ЖУК Уладзімір Іосіфавіч (н. 2.1.1941, в. Засулле Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), бел. мастак-плакатыст. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). Творы вылучаюцца лаканізмам выяўл. мовы, філасафічнасцю, часам у іх жорсткі сарказм, гумар: «Пабудаваны ў 18 ст. Рэканструяваны ў 20 ст.» (1974), «Лес — магутная крыніца здароўя» (1977), «Перабудова» (1987), «Мазыр. Віцебск» (1988), «26.IV. Чарнобыль» (1989), «Трэба любіць усё: звяроў, птушак, расліны, у гэтым — прыгажосць жыцця. А.Куприн», «За Радзіму, за Сталіна!» (абодва 1990), «Адраджэнне» (1992), «Што наша жыццё? Гульня!» (1995) і інш. Аўтар афіш для спектакляў «Тыль Уленшпігель» Я.Глебава (1979) у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі, «Пінская шляхта» (1980) нар. т-ра г. Слонім і інш.

ЖУКАВА Алена Ціханаўна (н. 22.12.1935, Віцебск), бел. вучоны-педагог у галіне тэхн. графікі. Канд. пед. н. (1980), праф. (1993). Скончыла Віцебскае маст.-графічнае пед. вучылішча (1954), Віцебскі пед. ін-т (1963), дзе працуе з 1965. Распрацавала тэарэт. і метадычныя пытанні ўдасканалення графічнай падрыхтоўкі школьнікаў і студэнтаў ВНУ. Аўтар вучэбных дапаможнікаў для школ, тэхнікумаў, ВНУ.

Тв.: Основы графической грамоты. Мн., 1966 (у сааўт.); Словарь-справочник по черчению. М., 1993 (у сааўт.).

ЖУКАВА Праскоўя Самойлаўна (н. 13.10.1921, в. Рэкта Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне агратэхнікі агародніннных культур. Д-р с.-г. н. (1970), праф. (1988). Засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1992). Скончыла Бел. с.-г. ін-т (Горкі, 1947). З 1956 у Бел.НДІ агародніцтва. Навук. працы па барацьбе з пустазеллем і выкарыстанні рэгулятараў росту раслін, даследаванні па пытаннях узаемадзеяння фізіялагічна актыўных рэчываў, раслін і глебы.

Тв.: Регуляторы роста и гербициды на овощных культурах и картофеле. Мн., 1990; Эффективность применения регуляторов роста в овощеводстве и картофелеводстве. М., 1990.

ЖУКАЎ Анатоль Барысавіч (6.8.1901, г. Харкаў, Украіна — 21.9.1979), савецкі лесавод, акад. АН СССР (1966). Скончыў Харкаўскі ін-т сельскай гаспадаркі і лесаводства (1923). Працаваў у доследным лясніцтве і на Цэнтр. лясной доследнай станцыі Украіны (1923—30), у Ін-це лясной гаспадаркі ў Харкаве (1930—37) і Гомелі (1938—42), ва Усесаюзным НДІ лесаводства і механізацыі лясной гаспадаркі (1942—56), у Ін-це лесу АН СССР (1956—58). У 1958—79 дырэктар Ін-та лесу і драўніны Сібірскага аддзялення АН СССР. Навук. працы па біяцэналогіі дубовых лясоў стварэнні лесапалос, вырошчванні лясоў прамысл. значэння, вывучэнні лясоў Сібіры, у прыватнасці лясоў басейна воз. Байкал.

У.Жук. Афіша спектакля «Тыль Уленшпігель» Я.Глебава ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета Беларусі. 1979.

ЖУКАЎ Анатоль Васілевіч (н. 19.1.1937, С.-Пецярбург), бел. вучоны ў галіне лясного машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1980), праф. (1981). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1960). З 1966 у Бел. тэхнал. ун-це. Навук. працы па распрацоўцы тэарэт. асноў праектавання лесатранспарт. машын, лесапрамысл. абсталявання, стварэнні аўтапаяздоў і серыі лясных машын на мінскіх аўтамаб. і трактарным з-дах.

Тв.: Лесные машины. Мн., 1989; Заготовка сортиментов на лесосеке. М., 1993 (разам з А.С.Федарэнчыкам, Ю.І.Праваторавым).

ЖУКАЎ Барыс Пятровіч (н. 12.11.1912, г. Самарканд, Узбекістан), расійскі вучоны ў галіне тэхн. хіміі. Акад. Рас. АН (1974; чл.-кар. 1968). Двойчы Герой Сац. Працы (1966, 1982). Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхнал. ін-т (1937). З 1937 у Цэнтр. н.-д. ін-це хіміі і механікі (Масква), з 1955 у Федэральным цэнтры двайных тэхналогій «Саюз» (у 1955—88 ген. дырэктар). Навук. працы па вывучэнні фізіка-хім. працэсаў кандэнсаваных сістэм. Даследаваў працэсы гарэння і каталізу порахаў і цвёрдага паліва, пераўтварэння энергіі гарэння ў кінетычную і эл., распрацаваў метады атрымання і тэхналогію вытв-сці высокатрывалых канструкцыйных матэрыялаў. Ленінская прэмія 1976, Дзярж. прэміі СССР 1951, 1967.

ЖУКАЎ Васіль Пятровіч (1922, в. Бярозаўка Бялёўскага р-на Тульскай вобл., Расія — 12.7.1944), удзельнік вызвалення Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). Камандзір кулямётнага разліку ст. сяржант Ж. у ліп. 1944 у баі за г. Масты Гродзенскай вобл. агнём са станковага кулямёта адбіў 3 контратакі праціўніка, адрэзаў яго пяхоту ад танкаў, гранатамі падбіў танк, пад другім загінуў сам.

ЖУКАЎ Георгій Канстанцінавіч (1.12.1896, в. Стралкоўка Калужскай вобл., Расія — 18.6.1974), савецкі ваен. і дзярж. дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1943), чатыры разы Герой Сав. Саюза (1939, 1944, 1945, 1956), Герой Манголіі (1969). У арміі з 1915, удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў. З 1930 камандзір 2-й кав. брыгады 7-й дывізіі (штаб у Мінску), у 1933—37 — 4-й кав. дывізіі імя К.Варашылава (базіравалася ў Слуцку), 3-га кав. корпуса (штаб у Мінску). У 1938—39 нам. па кавалерыі камандз. войскамі Бел. асобай ваен. акругі. У 1939 камандаваў сав.-манг. групоўкай у час канфлікту з Японіяй на р. Халхін-Гол. З 1940 камандз. войскамі Кіеўскай асобай ваен. акругі. У студз.—ліп. 1941 нач. Генштаба, нам. наркома абароны СССР. З 23.6.1941 чл. Стаўкі Вярх. Галоўнакамандз., са жн. 1942 1-ы нам. наркома абароны СССР і нам. Вярх. Галоўнакамандуючага; камандаваў Рэ-

зервовым, Ленінградскім, Зах., 1-м Укр., 1-м Бел. франтамі. Адзін з кіраўнікоў абароны Ленінграда, Масквы і разгрому ням.-фаш. войск пад Масквой. Каардынаваў дзеянні франтоў у *Сталінградскай бітве 1942—43*, у час прарыву блакады Ленінграда, *Курскай бітве 1943* і *бітве за Дняпро 1943*, у *Беларускай аперацыі 1944*. Камандаваў 1-м Бел. фронтам у *Вісла-Одэрскай аперацыі 1945* і *Берлінскай аперацыі 1945*, падпісаў за сав. бок акт аб капітуляцыі Германіі 8.5.1945 у Карлсхорсце (каля Берліна). 24.6.1945 прымаў Парад Перамогі ў Маскве. У 1945—46 каманд. сав. акупац. войскамі і гал. нач. Сав. ваен. адміністрацыі ў Германіі, адначасова

Б.П.Жукаў.

Г.К.Жукаў.

(сак.—чэрв. 1946) галоўнакаманд. сухап. войскамі і нам. міністра Узбр. Сіл СССР. З 1946 каманд. войскамі Адэскай, з 1948 Уральскай ваен. акруг. З 1953 1-ы нам., у 1955—57 міністр абароны СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1941—58. У 1958 зняты з усіх пасад і адпраўлены ў адстаўку. Аўтар кн. «Успаміны і роздум» (т. 1—3, 10-е выд., 1990). Імем Ж. названа малая планета.

ЖУ́КАЎ Мікалай Іванавіч (н. 20.5.1930, г. Шуя, Расія), бел. філосаф. Засл. дз. нав. Рэспублікі Беларусь (1992). Д-р філас. н. (1975), праф. (1976). Скончыў Ленінградскі ун-т (1958). Працаваў у Мінскім мед. ін-це (1960—69), у БДУ (1969—88). З 1988 заг. кафедры філасофіі Нац. АН Беларусі. Даследуе філас. праблемы прыродазнаўства і тэхнікі. Распрацаваў канцэпцыі функцыян. прыроды інфармацыі, трох узроўняў нематэрыяльных (ідэальных) працэсаў, даў арыгінальную трактоўку праблемам адзінства свету, штучнага інтэлекту, суадносін фармальнай логікі і дыялектыкі. Заснавальнік бел. навук. школы ў галіне філас. праблем тэорыі сістэм, кібернетыкі, матэматыкі і інфарматыкі. Аўтар падручнікаў для ВНУ па філасофіі, філас. асновах матэматыкі і кібернетыкі.

Тв.: Информация: (Философский анализ информации — центрального понятия кибернетики). Мн., 1966; Философские основания кибернетики. М., 1985; Проблема сознания: Филос. и специально-науч. аспекты. Мн., 1987.

ЖУ́КАЎ Мікалай Мікалаевіч (2.12.1908, Масква — 23.9.1973), рускі графік. Нар. мастак СССР (1963), чл.-кар. АМ СССР (1949). Вучыўся ў маст.-прамысл. тэхнікумах у Ніжнім Ноўгарадзе (1926—28) і Сараташе (1928—30). З 1943 маст. кіраўнік *студыі ваенных мастакоў* імя М.Б.Грэкава. У 1941—45 працаваў у франтавым друку і ў газ. «Правда» (1942—43). Аўтар тэматычных станковых серый малюнкаў, ілюстрацый, плакатаў, якім уласціва прастата сродкаў адлюстравання, пэўная эцюднасць. Сярод твораў: «Салдат зацягвае нітку» (1943), серыі «У.І.Ленін» (з 1940), «Пра дзяцей» (1943—68), «Нюрнбергскі працэс» (1946), «Цені мінулага» (1970—71), ілюстрацыі да кніг. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1951.

ЖУ́КАЎ Пётр Сяргеевіч (22.1.1921, в. Мікулічы Брагінскага р-на Гомельскай вобл. — 22.12.1967), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Кіеўскае пях. вучылішча (1941). У Чырв. Арміі з 1940. У Вял. Айч. вайну на Паўд.-Зах., Паўн.-Каўказскім, Паўд., Цэнтр., 1-м Бел. франтах. Вызначыўся ў час *Бабруйскай аперацыі 1944*, пры вызваленні вёсак на Пд ад Бабруйска. Да 1953 у Сав. Арміі, пасля на гасп. рабоце.

ЖУ́КАЎ Прохар Іванавіч (н. 17.1.1915, в. Альшоў Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне іхтыялогіі і аховы прыроды. Д-р біял. н. (1968), праф. (1969). Скончыў Усесаюзны зоатэхн. ін-т пушнасыравіннай гаспадаркі (1937). У 1967—77 дырэктар Бел.НДІ рыбнай гаспадаркі. Навук. працы па іхтыялогіі, рыбнай гаспадарцы, ахове прыроды.

Тв.: Рыбы Белоруссии. Мн., 1965; Рыбные ресурсы Белоруссии. Мн., 1983; Справочник по экологии пресноводных рыб. Мн., 1988; Карп: Экалогія і гасп. значэнне. Мн., 1994.

ЖУ́КАЎ Сцяпан Іванавіч [1.5.1923, в. Пушча (цяпер у межах в. Пірагі) Расонскага р-на Віцебскай вобл. — 24.7.1997], Герой Сав. Саюза (1946). Скончыў Віцебскі аэраклуб (1941), Чарнігаўскую ваен. школу пілотаў (1942), Вышэйшыя афіцэрскія лётна-тактычныя курсы (1952). У Вял. Айч. вайну на Цэнтр. і 1-м Бел. франтах. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, баёў у Германіі. Нам. камандзіра эскадрыллі штурмавога авіяпалка ст. лейтэнант Ж. зрабіў 121 баявы вылет, у т.л. 80 — на тэр. Беларусі. Да 1957 у Сав. Арміі.

М.Жукаў. Салдат зацягвае нітку. 1943.

ЖУ́КАЎ, малая планета № 2132. Сярэдні дыяметр 19 км, сярэдняя адлегласць ад Сонца 415,8 млн. км, перыяд абарачэння 4,6 г. Адкрыта ў 1975 у Крымскай астрафіз. абсерваторыі. Названа ў гонар Г.К.*Жукава*.

Літ.: Коротцев О., Дахие М. Созвездие памяти: Косм. мемориал героев Вел. Отеч. войны. СПб., 1995.

ЖУКА́ЎСКАС (Žukauskas) Альбінас (25.1.1912, в. Бубеле, Сувалкаўскае ваяв., Польшча — 10.8.1987), літоўскі пісьменнік. Засл. дз. культ. Літвы (1972), засл. работнік культ. Беларусі (1973). Вучыўся ў Віленскім ун-це і Варшаўскай вышэйшай школе журналістыкі (1935—39). Аўтар зб-каў вершаў «Часы і людзі» (1938), «Цяжкая радасць» (1970), «Сонцаварот» (1973), «Прыбярэжныя водмелі» (1975, Дзярж. прэмія Літвы 1976), «Прамаці» (1981), «Бяздонная любоў» (1983), кніг навел і апавяданняў «Зямля плыве на поўдзень» (1939), «Паветраны калодзеж» (1964), «Добрыя камяні» (1973), «Чаму плакаў хлеб» (1980), у якіх асэнсоўвае рэаліі гіст. мінулага літ. вёскі, людскія лёсы, паказвае стойкасць народа, харство роднага краю. На літ. мову пераклаў кнігі выбранай лірыкі Я.Купалы, Я.Коласа, А.Куляшова, М.Танка, асобныя творы П.Броўкі, З.Бядулі, М.Гарэцкага. На бел. мову яго творы перакладалі Р.Барадулін, А.Васілевіч, С.Грахоўскі, М.Калачынскі, А.Разанаў, Я.Семяжон, М.Танк, Н.Тарас, М.Хведаровіч, У.Шахавец.

Тв.: Бел. пер. — Бяздонная любоў. Мн., 1974.

А.В.Мальдзіс.

ЖУК-ГРЫШКЕ́ВІЧ Вінцэнт Антонавіч (23.2.1903, в. Будслаў Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 14.2.1989), дзеяч бел. эміграцыі, педагог, літаратуразнавец, гісторык. Д-р філасофіі (1952). Муж Р.М.*Жук-Грышкевіч*. Скончыў Віленскую бел. гімназію (1922), Пражскі ун-т (1927). У 1927—39 настаўнічаў у Вільні. Пасля заняцця горада Чырв. Арміяй (1939) арыштаваны органамі НКУС, засуджаны на 8 гадоў і зняволены ў Печлаг (Комі АССР). У 1942 вызвалены па амністыі, у складзе *Андэрса арміі* ваяваў супраць ням. фашыстаў. У 1945—49 выкладаў у вайск. школах у Італіі, потым у Англіі. Адзін з заснавальнікаў і першы старшыня *Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі* (1946), рэдактар час. «*Беларус на чужыне*», «На шляху». З 1950 у г. Таронта (Канада), з 1954 у Мюнхене (ФРГ), арганізаваў і

вёў бел. секцыю радыё «Вызваленне». З 1956 у Канадзе: арганізаваў і ўзначаліў Каардынацыйны к-т беларусаў (1966) і *Беларускі інстытут навукі і мастацтва* (1967). З 1968 1-ы нам. старшыні, у 1970—82 старшыня *Рады Беларускай Народнай Рэспублікі* на эміграцыі. Аўтар кн. «25 сакавіка» (1978). *М.М.Міцкевіч.*

ЖУК-ГРЫШКЕ́ВІЧ Раіса Мікалаеўна (н. 22.10.1919, г. Пружаны Брэсцкай вобл.), дзеяч бел. эміграцыі, пісьменніца. Жонка В.А.*Жук-Грышкевіча*. Скончыла Пружанскую польск. гімназію (1938), настаўнічала на Пружаншчыне. У Вял. Айч. вайну вывезена на прымусовыя работы ў Германію. Пасля вызвалення жыла ў бел. лагеры для перамешчаных асоб у Ватэнштэце. З 1949 у г. Таронта (Канада), скончыла ун-т (1954). З 1954 працавала ў г. Мюнхене (ФРГ), у Канадзе. З 1965 сакратар, рэферэнт па культуры, старшыня Гал. управы *Згуртавання беларусаў Канады*, заснавала *Згуртаванне беларускіх жанчын Канады*. З 1967 сябра, сакратар-скарбнік *Беларускага інстытута навукі і мастацтва* ў Канадзе; з 1973 скарбнік-сакратар Выдавецкага к-та пры Каардынацыйным к-це беларусаў Канады (ККБК), з 1989 старшыня ККБК. Аўтар кн. «Жыццё Вінцэнта Жук-Грышкевіча» (1993). *М.М.Міцкевіч.*

ЖУКІ́, ц в е р д а к р ы л ы я (Coleoptera), атрад насякомых. 2 падатр., драпежныя (Adephaga) і разнаедныя (Polyphaga). Каля 140 сям., больш за 300 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды, Цэнтр. Арктыкі, найб. высокіх горных вяршынь. Насяляюць сушу, прэсныя воды; асабліва многа ў тропіках. На Беларусі 100 сям., больш за 3 тыс. відаў. Найб. пашыраны прадстаўнікі 4 сям.: *жужалі*, *стафіліны*, слонікі, шчаўкуны.

Даўж. 0,2—200 мм. Афарбоўка розных колераў, часта з метал. бляскам. Цела мае галаву, грудзі і брушка. Покрыва цвёрдае, зрэдку мяккае (*мяккацелкі*). Галава часцей круглаватая, радзей выцягнута ў галаватрубку. Грудзі і брушка звычайна размежаваныя. Першая пара крылаў — цвёрдыя (адсюль другая назва) надкрылы (элітры), ахоўваюць другую (лятальную) пару крылаў і мяккі верхні бок брушка. Вусікі часцей 11-членікавыя. Ног 3 пары. Ротавы апарат грызучы. Раздзельнаполыя, пераважна яйцакладныя, радзей жывародныя. Пераўтварэнне поўнае (яйцо, лічынка, кукалка, імага). 1—3 пакаленні за год. Па характары кармлення — фітафагі, сапрафагі і заафагі. Глебаўтваральнікі, санітары, рэгулятары колькасці іншых насякомых, апыляльнікі раслін. Некат. — шкоднікі с.-г. і лясных культур, прадуктаў. Шэраг відаў выкарыстоўваецца ў біял. барацьбе з насякомымі-шкоднікамі.

Літ.: Фауна и экология жесткокрылых Белоруссии. Мн., 1991; Хотько Э.И. Почвенная фауна Беларуси. Мн., 1993; Каталог жесткокрылых (Coleoptera, Insecta) Беларуси. Мн., 1996; Silverberg H. Enumerato coleopterorum Fennoscanduae, Daniae et Baltiae. Helsinki, 1992; A Checklist of the Ground-Beetles of Russia and Adjacent Lands (Insecta, Coleoptera, Carabidae). Sofia; Moscow, 1995. *С.Л.Максімава*

ЖУ́КНЕВА, вёска ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 33 км на У ад г. Талачын. 112 км ад Віцебска, 15 км ад чыг. ст. Коханава. 260 ж., 106 двароў (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ЖУКО́ВІЧ Васіль Аляксеевіч (н. 7.11.1940, в. Забалацце Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1964). Працаваў у брэсцкай раённай газ. «Заря над Бугом», на Брэсцкай студыі тэлебачан-



Жукі: 1 — мерцвяед чырванагруды; 2 — мерцвяед матавы; 3 — магільшчык рыжабулавы; 4 — скураед вяндлінны; 5 — скураед музейны; 6 — святляк звычайны: самец (злева) і самка; 7 — мяккацелка бурая; 8 — мяккацелка парасонавая; 9 — свідравальшчык лісцевы; 10 — пчалажук звычайны; 11 — мурашка-жук; 12 — малашка медная; 13 — капуцын; 14 — прытворшчык шаўкавісты; 15 — тачылыпчык хлебны; 16 — шчаўкун грэбенявусы; 17 — шчаўкун бліскучы; 18 — шчаўкун чырвоны; 19 — вусач арлекін; 20 — бронзаўка афрыканская; 21 — афрыканскі таліяф; 22 — златка яванская двухколерная; 23 — алень: самка (злева) і самец; 24 — вусач рэліктавы.

ня, у газ. «Знамя юности», выд-вах «Мастацкая літаратура» і «Юнацтва». Друкуецца з 1956. Распрацоўвае жанры лірычнага, публіцыст. і жартоўна-гумарыст. верша, байкі, прытчы, эпіграмы і інш. (зб. «Паклон», 1974, «Мелодыя святла», 1976, «Суседства», 1982, «Цана цішыні», 1985, «Твая місія», 1988, «Разняволенне», 1990). Асн. тэмы творчасці — маральна-этычныя праблемы, вясковае дзяцінства і юнацтва, краса роднай прыроды, балючы клопат пра

В.А.Жуковіч.

В.А.Жукоўскі.

М.Я.Жукоўскі.

нац. карані беларуса, стан роднай мовы, культуры. У творах для дзяцей — добрае веданне дзіцячай псіхалогіі, уменне даступна гаварыць з малым чытачом (зб. загадак «Казачны сад», «Крылатыя сябры», «Нашы памочнікі», усе 1976; зб. вершаў, казак, загадак «Тараскаў самакат», 1988, «Гуканне вясны», 1992, «Цудоўная краіна», 1997, «Ад казкі — да спектакля», 1998). Аўтар лібрэта оперы-казкі «Пра тое, што было» (1991, муз. Э.Казачкова). На тэксты Ж. напісаны многія песні. У прозе паказвае героя ў незвычайных абставінах (аповесць для дзяцей «Як адна вясна...», 1980), апавяданні «Дарчыны галубы», «Трывожны верасень», «Кволы». На бел. мову пераклаў зб. апавяданняў П.Цвіркі «Салавейка» (1974), кн. А.Наваі «Лірыка» (1993), паасобныя вершы Махтумкулі, А.Міцкевіча, А.Фета, С.Ясеніна, Т.Шаўчэнкі, Л.Украінкі, І.Франко, П.Грабоўскага, У.Сасюры, Л.Кастэнкі, І.Няходы, Т.Каламіец, П.Маха, Э.Межэлайціса, П.Мацева і інш.

І.У.Саламевіч.

ЖУКО́ВІЧ Павел Антонавіч (1904, г. Барысаў Мінскай вобл. — 15.6.1944), адзін з кіраўнікоў патрыят. падполля і партыз. руху ў Мінскай і Вілейскай абл. у Вял. Айч. вайну. З 1939 заг. аддзела Чашніцкага, 1-ы сакратар Куранецкага райкомаў КП(б)Б. Са жн. 1942 у тыле ворага, у кастр. 1942 — ліп. 1943 кіраўнік Барысаўскага падп. міжрайпартцэнтра, потым чл. Вілейскага падп. абкома КП(б)Б, упаўнаважаны па паўд.-ўсх. зоне Вілейскай вобл.

ЖУКО́ВІЧ Платон Мікалаевіч (26.9.1857, г. Пружаны Брэсцкай вобл. — 30.11.1919), бел. гісторык. Чл.-кар. Расійскай АН (1918). Праф. (1894). Д-р царк. гісторыі (1901). Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1881). Выкладаў у Полацкім духоўным вучылішчы, у Вільні, з 1891 у Пецярбургскай духоўнай акадэміі. У 1918 уваходзіў у *Беларускае вольна-эканамічнае таварыства* ў Петраградзе. Даследаваў рэліг. адносіны ў Рэчы Паспалітай, палітыку Расіі на Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай.

Тв.: Кардинал Гозий и польская церковь его времени. СПб., 1882; Борьба против унии на современных ей литовско-польских сеймах (1595—1600 гг.). СПб., 1897; Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией. Вып. 1—6. СПб., 1901—02.

В.В.Грыгор'ева.

ЖУКО́ЎСКАГА ТЭАРЭ́МА, тэарэма аб *пад'ёмнай сіле*, што дзейнічае на цела ў плоскапаралельнай плыні несціскальнай вадкасці або газу. Паводле Ж.т., пад'ёмная сіла абумоўлена звязанымі з абцякальным целам віхрамі (т. зв. далучанымі віхрамі), што ўзнікаюць з-за наяўнасці вязкасці ў вадкасці або газе. Ж.т. выконваецца пры дагукавых скарасцях і ляжыць у аснове тэорыі крыла самалёта, грабнога вінта, лапатак турбін, кампрэсараў і інш. Устаноўлена М.Я.*Жукоўскім* (1904).

ЖУКО́ЎСКАЯ (Żukowska) Юзафата (1772, Лідскі пав. — 23.1.1845), польская актрыса. Працавала на Беларусі: у трупах Д.Мараўскага (1795) і М.Кажынскага (1801—04) у Гродне, у 1804, 1806 у т-ры С.Дэшнер у Мінску, у 1811—32 у трупе мужа А.Ш.*Жукоўскага*, у 1844 — Я.Хелмікоўскага. Пасля 1795 і ў 1834—38 працавала ў Вільні. З поспехам выконвала рознахарактарныя ролі: пажылых кабет і бабуль, ключніц, цыганак, прыслужніц, жабрачак і інш.

Ю.А.Пашкін.

ЖУКО́ЎСКІ [імя невяд.; 1746 (?), г. Слуцк Мінскай вобл. — ?], танцоўшчык. З мяшчан. Вучыўся ў балетнай школе Г.Ф.Радзівіла з 1756 (у А.*Пуціні* і Л.М.*Дзюпрэ*) і танцаваў у яго прыдворным т-ры ў Слуцку (дэбютаваў у 1758 у «Балеце на тры пары», лібрэта і паст. Пуціні), а таксама ў г. Белым (Бяла-Падляска, Польшча), гастраліраваў у Нясвіжы (1757, 1759). З 1760 саліст балета Нясвіжскага т-ра М.К.Радзівіла Рыбанькі (упамінаецца ў складзе трупы ў 1787—90).

Г.І.Барышаў.

ЖУКО́ЎСКІ (Żukowski) Антані Шыман [1766 (?) — 1834 (?)], бел. акцёр, антрэпрэнёр. У 1790—92 узначальваў польскія трупы ў Мінску і Вільні. У 1795 стварыў у Магілёве трупу, якая ставіла спектаклі на польск. і рус. мовах. У 1795 трупа вольных акцёраў пад кіраўніцтвам Ж. па запрашэнні графа С.Зорыча працавала ў яго Шклоўскім т-ры (выконвала польск. і рус. камедыі). Трупа Ж. выступала ў Гродне (1827, 1828, 1830), Зэльве (1816). З 1811 узначальваў мінскую антрэпрызу, фактычна наладзіў рэгулярныя тэатр. паказы ў горадзе. З мінскай трупай гастраліраваў па Беларусі. У ёй выступалі вядомыя тагачасныя акцёры — К.*Скібінскі*, Ю.*Жукоўская*.

ЖУКО́ЎСКІ Барыс Елісеевіч (14.5.1900 — 13.1.1973), рускі тэатр. педагог, акцёр. Нар. арт. Расіі (1955). З 1922 на пед. рабоце (з 1924 у Ленінградскім тэатр. ін-це імя А.Астроўскага). Праф. (1944). З 1923 акцёр Ленінградскага т-ра імя А.Пушкіна. У 1934—37 маст. кіраўнік Бел. студыі пры Цэнтр. тэатр. вучылішчы ў Ленінградзе. Вял. ўвагу аддаваў развіццю вобразнага мыслення студыйцаў, уменню пранікнуць у сутнасць вобраза, што яскрава выявілася ў спектаклях «Не было ні гроша, ды раптам шастак» А.Астроўскага (1936) і «Банкір» А.Карнейчука (1937). Дзярж. прэмія СССР 1951.

ЖУКО́ЎСКІ Васіль Андрэевіч (9.2.1783, с. Мішанскае Тульскай вобл., Расія — 24.4.1852), рускі паэт, адзін з заснавальнікаў рус. рамантызму. Акад. Пецярбургскай АН (з 1841). Выхавальнік пры царскім двары (1815—41). Бараніў ад урадавай рэакцыі А.Пушкіна, М.Лермантава, дзекабрыстаў, садзейнічаў выкупу з прыгонніцкай няволі Т.Шаўчэнкі. Удзельнік групы «*Арзамас*». Выступіў у л-ры як паэт-сентыменталіст (элегіі «Сельскія могілкі», 1802, «Вечар», 1806). Аўтар рамант. балад «Людміла» (1808), «Касандра» (1809), «Святлана» (1808—12), «Вадзім» (1814—17), «Іванаў вечар» (1822) і інш., оды «Пясняр у стане рускіх воінаў» (1812). Паэзіі Ж. ўласцівы інтанацыйна-рытмічнае багацце, эмац. выразнасць, музыкальнасць. Шырока вядомы яго пераклады балад і драмы Ф.Шылера «Арлеанская дзева» (1817—21), «Адысеі» Гамера (1842—49), часткі паэмы Фірдаўсі «Шахнамэ» і інш. Аўтар вершаваных апрацовак нар. казак, якія трапілі ў бел. фальклор (зб. А.*Глінскага*). На бел. мову творы Ж. перакладалі В.Зуёнак, Э.Валасевіч.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М.; Л., 1959—60; Соч. Т. 1—3. М., 1980; Эстетика и критика. М., 1985.

Літ.: Бессараб М. Жуковский. 2-е изд. М., 1983; Афанасьев В. Жуковский. М., 1985; Иезуитова Р.В. Жуковский и его время. Л., 1989.

І.У.Саламевіч.

ЖУКО́ЎСКІ Мікалай Ягоравіч (17.1.1847, г. Арэхава-Зуева Уладзімірскай вобл., Расія — 17.3.1921), рускі вучоны, заснавальнік сучаснай гідра- і аэрамеханікі. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1894). Скончыў Маск. ун-т (1868). Праф. Маск. ун-та (з 1886) і Маск. вышэйшага тэхн. вучылішча (з 1887). Ар-

ганізатар і першы кіраўнік (з 1918) Цэнтр. аэрагідрадынамічнага ін-та (ЦАГІ). Навук. працы па тэорыі авіяцыі, механіцы цвёрдага цела, гідрадынаміцы, гідраўліцы, астраноміі, матэматыцы і інш. Стварыў тэорыю гідраўлічнага ўдару (1898), адкрыў закон, які вызначае пад'ёмную сілу крыла самалёта (гл. *Жукоўскага тэарэма*), тэарэтычна прадказаў шэраг магчымых траекторый лёту (напр., «мёртвую пятлю», якую выканаў рус. лётчык П.М.Несцераў, 1913). У 1912—18 распрацаваў віхравую тэорыю паветр. вінта; вызначыў найб. прыдатныя профілі крылаў і лопасцей вінта самалёта. Прапанаваў тэорыю ўтварэння каметных хвастоў, метад вызначэння элементаў планетных арбіт, выканаў шэраг грунтоўных даследаванняў па тэорыі механізмаў, тэорыі ўстойлівасці руху і інш. Стварыў некалькі навук. школ у галіне дастасавальнай механікі.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—7. М.; Л., 1948—50.
Літ.: Космодемьянский А.А. Н.Е.Жуковский. М., 1969; Н.Е.Жуковский — библиография печатных трудов. М., 1968.

ЖУКО́ЎСКІ Міхал, бел. гравёр 18 ст. Працаваў у г. Львоў (Украіна) і Нясвіжы пры двары кн. М.К.Радзівіла Рыбанькі. Стварыў медзярыты на тэмы пастановак Нясвіжскага прыдворнага т-ра У.Радзівіл, якія былі выкарыстаны ў кнізе «Камедыі і трагедыі...» (1754, с. Жоўква, цяпер г. Несцераў, Украіна).

ЖУКО́ЎСКІ Пётр Міхайлавіч (22.1.1888, Кішынёў — 2.10.1975), савецкі батанік і раслінавод. Акад. УАСГНІЛ (1935), чл.-кар. (1955) і ганаровы д-р (1967) Герм. акадэміі с.-г. навук. Скончыў Новарасійскі ун-т (Адэса, 1911). З 1920 дырэктар Бат. сада, з 1923 праф. Політэхнічнага ін-та ў Тбілісі; у 1934—52 праф. Маскоўскай с.-г. акадэміі імя К.А.Ціміразева; у 1951—60 дырэктар Усесаюзнага н.-д. ін-та раслінаводства, з 1962 праф. Ленінградскага ун-та. Навук. працы па паходжанні, эвалюцыі, геаграфіі культ. раслін, марфалогіі і генетыцы. Аўтар падручніка «Батаніка» (5 выд., 1982). Дзярж. прэмія СССР 1943. Прэмія імя М.І.Вавілава АН СССР 1967.

ЖУКО́ЎСКІ Станіслаў Юльянавіч (13.5.1875, в. Ендрыхаўцы Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. — жн. 1944), жывапісец. Акад. жывапісу (з 1907). Скончыў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства (1901), дзе вучыўся ў І.*Левітана*, В.*Сярова*. Быў чл. Т-ва перасоўных выставак (з 1903), Саюза рус. мастакоў (з 1907). З 1917 у Польшчы, у 1920 адкрыў прыватную школу жывапісу ў Варшаве. Пісаў пейзажы, інтэр'еры, нацюрморты. Сярод твораў: «Нёман» (1895), «Веснавая вада» (1898), «Месячная ноч» (1899), «Першыя прадвеснікі вясны. Пралескі» і «Стары маёнтак» (абодва 1910), «Радасны май» (1912), «Зімовая ноч» (1919), «Рака на Палессі» (1928), «Інтэр'ер. Пакой мастака на вуліцы Кошыкавай у Варшаве» (1930), «Крыгаход на Нёмане» (1931), «Рака Вілейка» (1932). У Нац. маст. музеі Беларусі каля 40 карцін Ж., у т.л. «Возера Сенеж» (1902), «Старая сядзіба» (1910), «Інтэр'ер» (1916) і інш.

ЖУКО́ЎСКІ, горад у Расіі, у Маскоўскай вобл., на р. Масква. 101,3 тыс. ж. (1992). Чыг. ст. Буйны цэнтр праектавання і выпрабавання самалётаў. Маш.-буд. прам-сць (з-ды: маш.-буд., мантажных загатовак), дрэваапрацоўчы і дамабуд. камбінаты; ф-ка папяровых вырабаў і інш. Цэнтр. аэрагідрадынамічны ін-т (ЦАГІ), Лётна-даследчы ін-т, ф-т аэрамеханікі і лятальнай тэхнікі Маскоўскага фіз.-тэхн. ун-та (пры ЦАГІ) і інш. Названы ў гонар рас. вучонага М.Я.*Жукоўскага*.

С.Жукоўскі. Стары маёнтак. 1910.

ЖУКО́ЎСКІ-ЗІЛЬБЕР Меер Шоламавіч (23.8.1907, г. Брэст — 7.3.1985), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. З 1924 кіраваў «тэхнікай» (друкарняй) Брэсцкага акруткома КСМЗБ, з 1928 — «цэнтральнай тэхнікай» КПЗБ. Адзін з арганізатараў падп. друкарняў КПЗБ у Гродне, Вільні, Беластоку, Брэсце, Варшаве. У 1936 арыштаваны і засуджаны на 10 гадоў (вызвалены ў час паходу Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь у вер. 1939). З 1941 на гасп. рабоце ва ўсх. абласцях СССР. Аўтар успамінаў «Цэнтральная тэхніка КПЗБ» (у кн. «У суровыя гады падполля», 1958). *М.П.Клімец.*

ЖУКО́ЎШЧЫНА, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., каля аўтадарогі Дзятлава—Ліда. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 11 км на Пд ад г.п. Дзятлава, 154 км ад Гродна, 24 км ад чыг. ст. Навагрудак. 405 ж., 132 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ЖУКО́ЦІН, Джукетаў, горад *Балгарыі Волжска-Камскай* (цяпер гарадзішча каля г. Чыстапаль у Татарстане). Узнік у дамангольскі перыяд. У залатаардынскія часы (канец 13—14 ст.) багацейшы горад Волжскай Балгарыі. Разбураны ў 1-й пал. 15 ст. На гарадзішчы знойдзена шмат манет, у т.л. скарбы. У 1923 знойдзены т.зв. Джукетаўскі скарб залатых і сярэбраных упрыгожанняў канца 14 ст., які сведчыць пра высокае майстэрства балг. рамеснікаў-ювеліраў.

ЖУЛА́Н, птушка, гл. ў арт. *Саракушы*.

ЖУЛЕ́ГА Рыгор Прохаравіч (1.1.1922, в. Старая Дуброва Акцябрскага р-на Гомельскай вобл. — 22.6.1973), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну на Карэльскім, 2-м Бел. франтах. Памочнік камандзіра ўзвода разведкі ст. сяржант Ж. вызначыўся ў баях у Карэліі, Мурманскай вобл., на тэр. Германіі. Пасля вайны жыў і працаваў на радзіме.

ЖУ́ЛІКАЎ Пётр Георгіевіч (вер. 1910, с. Крэпасць Узень Вольскага р-на Саратаўскай вобл., Расія — 1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Брэсцкага патрыятычнага падполля* ў Вял. Айч. вайну. Скончыў Камуніст. ун-т у Маскве (1934), курсы партактыву пры ЦК ВКП(б) (1937). З кастр. 1939 на парт. рабоце на Беларусі, са студз. 1941 сакратар парт. к-та Брэсцкага чыг. вузла, чл. Брэсцкага гаркома КП(б)Б. У жн. 1941 у акупіраваным Брэсце Ж. (падп. псеўд. Пятроў) — ініцыятар стварэння гар. кіруючага парт. цэнтра, які аб'ядноўваў 7 падп. арг-цый (125 чал.). 10.10.1943 акупанты схапілі яго і закатавалі ў турме.

ЖУЛКО́ЎСКІ (Żółkowski) Фартунат Алойзы (2.11.1777, Навагрудчына — 11.9.1822), польскі акцёр, драматург. Удзельнік паўстання 1794. Працаваў у Львове, з 1797 у Варшаве, дзе выдаваў гумарыст. часопісы, выступаў у Нац. т-ры, для якога перакладаў і перарабляў камедыі з замежных моў. Аўтар папулярных камедый і вадэвіляў «Гавал на месяцы» (1805), «Палац Люцыпара» (1811), «Уваход у Літву» (1812), «Амата-

ры дукатаў», «Гультаі» (абодва 1813), «Гувернёр» (1816), «Старапольскі шляхціц» (1821) і інш. *А.В.Мальдзіс.*

ЖУНДЫАЙ (Jundiaí), горад на ПдУ Бразіліі, у штаце Сан-Паўлу. Засн. ў 1655. Каля 350 тыс. ж. (1995). Уваходзіць у склад Вял. *Сан-Паўлу*. Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: тэкст., хім., металургічная, маш.-буд. (вытв-сць тэкст. машын). Цэнтр раёна вінаградарства.

ЖУ́НІН Сяргей Георгіевіч (31.8.1906, с. Мядзведзіцкае Кімрскага р-на Цвярской вобл., Расія — 27.1.1977), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай і Брэсцкай абл. у Вял. Айч.

С.Г.Жунін.

Л.Жуо.

вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1928. З чэрв. 1941 на Зах. фронце, нам. камандзіра танк. палка. З ліп. 1941 у партызанах: арганізатар атрадаў у Круглянскім і Шклоўскім р-нах, камандзір групы атрада «Сяргея», адначасова ў кастр. 1942 — жн. 1943 камандзір 8-й Круглянскай партыз. брыгады, у жн.—снеж. 1943 — Круглянскай ваенна-аператыўнай групы, потым — 8-й партыз. брыгады. Аўтар кн. «Ад Дняпра да Бугa» (1974).

ЖУ́НІНА Ларыса Аляксандраўна (25.7.1914, г. Мсціслаў Магілёўскай вобл. — 18.10.1981), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі шкла. Д-р тэхн. н. (1968), праф. (1970). Скончыла БПІ (1938), дзе працавала з 1946, з 1976 у Бел. тэхнал. ін-це. Навук. працы па даследаванні механізмаў утварэння сілікатных матэрыялаў і распрацоўцы новых відаў шкла і сіталаў са спец. ўласцівасцямі.

Тв.: Минералообразование в процессе кристаллизации шлакосодержащего ситалла пироксенового состава (у сааўт.) // Эксперимент в области технического минералообразования (у сааўт). М., 1975.

ЖУО́ (Jouhaux) Леон (1.7.1879, Парыж — 28.4.1954), дзеяч франц. і міжнар. прафс. руху. У 1909—40 і 1945—47 ген. сакратар франц. *Усеагульнай канфедэрацыі Працы*. Чл. франц. дэлегацыі на *Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919—20*. Чл. Міжнар. бюро працы пры Лізе Нацый. У 1919—40 адзін з лідэраў *Амстэрдамскага інтэрнацыянала прафсаюзаў*. У 2-ю сусв. вайну вязень канцлагера Бухенвальд (1943—45). З 1947 старшыня Эканам. савета Францыі. З 1949 віцэ-прэзідэнт Міжнар. саюза свабодных прафсаюзаў і старшыня Міжнар. Савета Еўрап. руху. Аўтар кн. «Разбраенне» (1927). Нобелеўская прэмія міру 1951.

ЖУ́ПА, адм.-тэр. адзінка ў паўд. і зах. славян у 10 — пач. 20 ст. На чале Ж. стаяў жупан (першапачаткова радавы старэйшына, пазней феадал). У тапаніміцы Югаславіі, Харваты, Славеніі і інш. Ж. — назва некат. гіст. абласцей.

ЖУПА́Н, старадаўняе верхняе мужчынскае і жаночае адзенне ў палякаў, беларусаў і інш. слав. народаў. У 16—19 ст. быў абавязковай часткай адзення шляхты, мяшчан, укр. казакоў. Шылі пераважна з белага або шэрага сукна (радзей атласу, аксаміту). Крой двухбортны з вузкімі рукавамі і стаячым каўняром, спінка прыталеная, з бакоў устаўляліся кліны. Пярэднія гладкія полкі зашпільвалі на гузікі і падпяразвалі поясам. Паверх Ж. насілі *кунтуш*.

ЖУПА́НАЎСКАЯ СО́ПКА, дзеючы вулкан на ПдУ п-ва Камчатка. Складзены з андэзітавай і базальтавай лаваў. Мае 3 злітныя конусы, якія ўтвараюць хрыбет, выцягнуты на ПнЗ на 25 км. Самы ўсх. вулкан дасягае выш. 2927 м. Слабая фумарольная дзейнасць. На схілах ледавікі. Апошняе вывяржэнне ў 1957.

ЖУПА́НЧЫЧ (Župančić) Отан (23.1.1878, в. Вініца, Славенія — 11.6.1949), славенскі паэт; адзін з прадстаўнікоў т. зв. «славенскага мадэрну». Чл. Славенскай акадэміі навук і мастацтваў (1938). Дырэктар Нац. т-ра ў Любляне (1918—49). У першым паэт. зб. «Чаша п'янлівасці» (1899) адчуваецца ўплыў дэкадансу. Зб. «Праз раўніну» (1904) поўны жыццесцвярджальных ідэй і вобразаў. Аўтар зб-каў «Маналогі» (1908), «На досвітку дня Віда» (1920; на грамадска-паліт. тэмы), «Барвінак пад снегам» (1945). Яго творчасці ўласціва сувязь з нар.-паэт. традыцыямі: кн. для дзяцей «Пісанкі» (1900), «Сто загадак» (1915), п'есы «Ноч на свята верных душ» (1904) і інш. Вядомы як публіцыст і перакладчык. Творы Ж. на бел. мову перакладаў Н.Гілевіч (анталогія «Маці мая, Славенія», 1976, і інш.).

Тв.: Бел. пер. — У вечным дазоры. Мн., 1986; Рус. пер. — Лирика. М., 1978.

І.А.Чарота.

ЖУПРА́НСКІ КАСЦЁЛ, помнік архітэктуры 2-й пал. 19 ст. Пабудаваны ў в. Жупраны Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. ў стылі псеўдаготыкі. Мураваны прамавугольны ў плане 3-нефавы храм з вежай-званіцай на гал. фасадзе. Маляўнічасць фасадам надае мяшаная тэхніка муроўкі: асн. ўчасткі сцен з буту з украпінамі маленькіх каменьчыкаў; пілоны, якія ўмацоўваюць вуглы асн. аб'ёму і званіцы, абрамленні аконных, дзвярных праёмаў і блендаў з цэглы. Дах 2-схільны з трохвугольным атыкам на алтарным і прамавугольным на гал. фасадах, завершаны дэкар. вежачкамі. Карнізны пояс з высокім складаным па малюнку аркатурным фрызам падзяляе будынак на 2 ч.: ніжнюю, амаль глухую, і верхнюю, расчлянёную спічастымі праёмамі. Званіца 3-ярусная, завершана шатровым дахам. Побач з касцёлам на могілках — магіла Ф.*Багушэвіча* і яго сям'і. *Ю.А.Якімовіч.*

ЖУПРА́НЫ, вёска ў Ашмянскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Ашмянка, на аўтадарозе Вільнюс — Мінск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на ПнУ ад Ашмян, 198 км ад Гродна, 7 км ад чыг. ст. Ашмяны. 795 ж., 288 двароў (1997).

Да арт. **Жупан**. Партрэт К.Весялоўскага ў жупане з кунтушом. Невядомы мастак. 1636.

Жупранскі каспёл.

Вядомыя з пач. 15 ст. як цэнтр воласці, што належаў вял. князю ВКЛ. З 1407 да пач. 16 ст. ўласнасць Манівідавічаў, потым да пач. 19 ст. — Радзівілаў. На карце Т.Макоўскага 1613 пазначаны як мястэчка. З 1795 у складзе Рас. імперыі, у Ашмянскім пав. Віленскай губ. З 1811 уладанне Чапскіх. У 1880-я г. — 284 ж., 57 двароў. З 1921 у складзе Польшчы, у Ашмянскім пав. Віленскага ваяв. З 1939 у БССР, з 12.10.1940 цэнтр сельсавета Ашмянскага р-на. У 1971 — 423 ж., 121 двор.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Магіла Ф.*Багушэвіча* і помнік яму (у вёсцы). Помнік архітэктуры — *Жупранскі касцёл* (19 ст.).

ЖУР, даўняя бел. страва з аўсянай мукі. Рошчыну рабілі з неабтоўчанага аўса́ або вотруб'я і ставілі квасіць (каб хутчэй укісла, клалі кавалачак хлеба). Калі рошчына ўкісала, яе працэджвалі на сіта і давалі адстаяцца. Рэдкую частку (квасліны, малако) злівалі і варылі Ж., а з густой (цэда) — кісель. Ж. падсольвалі, заскварвалі або запраўлялі алеем і елі звычайна з бульбай. Вядомы па ўсёй Беларусі. *Г.Ф.Вештарт.*

ЖУРАВЕ́ЛЬ, археалагічная стаянка сожскай культуры позняга мезаліту (6—5-е тыс. да н.э.) каля в. Журавель Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл., на правым беразе р. Сож. Выяўлены больш за 6 тыс. адзінак інвентару, у т.л. 290 прылад працы, агнішча і майстэрня па апрацоўцы крэменю. На ПдЗ ад стаянкі курганны могільнік (1977, 43 насыпы).

Літ.: Копытин В.Ф. Поздний мезолит Посожья // Изыскания по мезолиту и неолиту СССР. М., 1983.

ЖУРАВЕ́ЛЬ (лац. Grus), сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Дзве найб. яркія зоркі 1,7 і 2,1 візуальнай *зорнай велічыні*. На тэр. Беларусі часткова бачны ў жніўні—верасні. Гл. *Зорнае неба*.

«ЖУРАВЕ́ЛЬ», бел. нар. танец. Лакальныя назвы «Жораў», «Бусел». Паходзіць са стараж. карагодаў, дзе выканаўцы пераймалі рухі жураўля. Танцоры выстройваліся ланцужком ці парамі і ішлі па крузе, выпісваючы розныя зігзагі, потым станавіліся касяком, рабілі паклоны з узнятымі і злучанымі ўверсе рукамі, што нагадвала рухі жураўля. У асобных варыянтах танца захаваліся элементы гульні і гумару, уласцівыя абраду калядавання: «журавель» танцаваў, імправізаваў, торкаў дзюбай прысутных. Часта «Ж.» выконвалі з прыпеўкамі. *Ю.М.Чурко.*

«ЖУРАВЕ́ЛЬ», бел. танец-гульня. Некалькі дзяўчат танцуюць і спяваюць, інш. ахоўваюць іх ад «жураўлёў» (хлопцаў). Калі хлопцы лавілі дзяўчат, спявалі ўсе разам (запіс А.Я.Васільевай, 1879). У запісе П.М.Шпілеўскага (1853) выканаўцы павольна падымаюць то правую, то левую нагу, імітуючы крокі жураўля. У цэнтры круга ходзіць хлопец — «журавель». Калі пары кружацца, ён імкнецца выхапіць якую-н. дзяўчыну з рук кавалера. Калі дзяўчаты закрычаць: «Хапай, журавель!» — ён павінен схапіць за руку дзяўчыну і станцаваць з ёй адзін круг. «Жураўлём» у крузе застаецца хлопец без пары. У танцах і гульнях пра жураўля выяўляюцца стараж. вераванні ў культ птушак (жывёльны *татэмізм*). *Ю.М.Чурко.*

ЖУРАВЕ́ЛЬ Сяргей Барысавіч (н. 1.6.1954, Мінск), бел. акцёр. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976), працаваў у Бел. рэсп. т-ры юнага гледача, з 1985 у Дзярж. маладзёжным т-ры Беларусі. Творчай манеры Ж. характэрны экспрэсіўнасць, тэмперамент, абаяльнасць і ўнутр. такт. Сярод лепшых роляў: Бэмбі («Бэмбі» Ф.Зальтэна, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1980), Гайліс («Подых навальніцы» паводле І.Мележа), Санька («У спадчыну — жыццё» А.Петрашкевіча), паніч Казік Валахоўскі, Бен-Равуні («Капыска чатырох чараўніц», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» паводле У.Караткевіча). Здымаецца ў тэлеспектаклях. *В.А.Грыбайла.*

ЖУРАВЕ́ЛЬНІК, кветкавая расліна, тое, што *герань*.

ЖУРАВІ́НЫ (Oxycoccus), род кветкавых раслін сям. верасовых. 4 віды. Пашыраны ў халодных і ўмераных абласцях Паўн. паўшар'я. На Беларусі 2 віды: Ж. балотныя (O. palustris) і драбнаплодныя (O. microcarpus). Растуць пераважна на сфагнавых балотах, нярэдка ўтвараюць зараснікі. У шэрагу раёнаў Беларусі створаны спецыялізаваныя заказнікі-журавіннікі. У культуры вырошчваюць Ж. буйнаплодныя (O. macrocarpus), інтрадукаваныя з Паўн. Амерыкі.

Шматгадовазялёныя паўкусты і кусцікі з тонкім, доўгім (даўж. больш за 1 м), разгалінаваным сцяблом, якое сцелецца, і дробным чаргаваным суцэльным скурыстым лісцем. Кветкі двухполыя, дробныя, ружовыя, на доўгіх кветаножках, па 1—6 у парасонападобных суквецці. Плод — цёмна-чырв. ягада. Ягады маюць лімонную, бензойную і інш. к-ты, пекціны, гліказід вакцыніін, вітаміны С і Р. Захоўваюцца доўгі час, шырока выкарыстоўваюцца ў харч. і лікёра-гарэлачнай прам-сці. Лек., харч., кармавыя, вітамінаносныя і меданосныя расліны. *Г.У.Вынаеў.*

Журавіны балотныя.

ЖУРА́ВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—31 і ў 1935—56. Утвораны 17.7.1924 у *Магілёўскай акрузе* (да 26.7.1930), з 20.2.1938 у Гомельскай вобл. Цэнтр — в. *Журавічы*. Падзяляўся на 11 сельсаветаў. Пл. 635 км^2, нас. 33 755 чал. (1935); 189 нас. пунктаў. Скасаваны 8.7.1931, яго тэр. перададзена ў Быхаўскі, Кармянскі, Прапойскі і Рагачоўскі р-ны. 5.4.1935 *Доўскі раён* перайменаваны ў Ж.р. З 26.5.1935 падзяляўся на 14 сельсаветаў. Скасаваны 17.12.1956, тэр. далучана да Быхаўскага і Рагачоўскага р-наў.

ЖУРА́ВІЧЫ, Старыя Журавічы, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Гутлянка. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 42 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Рагачоў, 102 км ад Гомеля. 968 ж., 396 двароў (1997).

Вядомыя з канца 16 ст. як маёнтак у Рэчыцкім пав. ВКЛ. З 1772 у Рас. імперыі. У 1784 мяст. Быхаўскага пав. Магілёўскай губ. У канцы 19 ст. за 3 км ад Ж. узнікла вёска пад назвай Новыя Ж. У 1886 — 2179 ж., Ільінская царква, касцёл, сінагога, 2 гарбарныя майстэрні, штогод 4 кірмашы. У 1894 адкрыты школа, лячэбніца, аптэка, у 1905 — нар. вучылішча. З 1905 мяст. Рагачоўскага пав., 3200 ж. З 1924 цэнтр сельсавета. З 15.7.1935 мястэчка, з 27.9.1938 вёска. У 1924—31, 1935—56 цэнтр *Журавіцкага раёна*. З 14.8.1941 да 25.11.1943 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ж. і раёне 2477 чал., вёску двойчы (1941, 1943) часткова спалілі. У 1971 у Ж. 1417 жыхароў.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму.

ЖУ́РАЎ Анатоль Яфімавіч (24.2.1922, г. Гомель — 15.6.1977), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1967), праф. (1968). Скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1946), Гомельскі пед. ін-т (1947). З 1946 сакратар Гомельскага абкома ЛКСМБ, з 1948 на пед. рабоце ў Аршанскім настаўніцкім, Мінскім пед., Бел. тэатр.-маст. ін-тах, з 1967 у БДУ, з 1972 заг. кафедры гісторыі КПСС Бел. політэхн. ін-та. Асн. працы па гісторыі ЛКСМБ. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1970.

Тв.: Камсамол Беларусі ў барацьбе за сацыялізм (1918—1941 гг.). Мн, 1957; У баях народжаны: Кароткі нарыс гісторыі камсамола Беларусі. 2 выд. Мн., 1970.

ЖУРАЎКО́Ў Міхаіл Анатолевіч (н. 19.11.1961, г. Салігорск Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне механікі і геамеханікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1993), праф. (1996). Скончыў БДУ (1984). З 1984 у Бел. н.-д. і праектным ін-це горнай і хім. прам-сці, з 1997 у БПА. Навук. працы па інтэгральных ураўненнях, механіцы дэфармаванага цвёрдага цела, матэм. мадэляванні.

Тв.: Метод квазифункций Грина в механике деформируемого твердого тела. Мн., 1993 (разам з М.Дз.Мартыненкам); Теоретические основы деформационной механики блочно-слоистого массива соляных горных пород. Мн., 1995 (з ім жа). *П.М.Бараноўскі.*

ЖУРАЎЛЁЎ Васіль Пракопавіч (н. 27.5.1931, в. Раздзел Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. крытык і літ.-

знавец. Д-р філал. н. (1986). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1954). З 1957 у Ін-це л-ры Нац. АН Беларусі. Друкуецца з 1957. Даследуе гісторыю бел. л-ры, тэарэт. праблемы бел. літ.-знаўства, паэтыку маст. твора. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1—2, 1965—66), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 2, 1969; на рус. мове 1977), кніг «Праблемы сучаснай беларускай прозы» (1967), «Беларуская савецкая проза: Апавяданне і нарыс» (1971), «Пытанні паэтыкі» (1974), «Магчымасць рэалізму» (1982).

Тв.: Структура твора: Рух сюжэтна-кампаз. форм. Мн., 1978; Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана. Мн., 1991.

ЖУРАЎЛЁЎ Дзмітрый Мікалаевіч (24.10.1900, с. Аляксееўка Першамайскага р-на Харкаўскай вобл., Украіна — 1991), расійскі акцёр, артыст эстрады. Нар. арт. СССР (1979). У 1927 скончыў вучылішча пры Т-ры імя Я.Б.Вахтангава; да 1939 акцёр гэтага т-ра. На эстрадзе з 1931. Майстар мастацкага слова. У рэпертуары творы А.Пушкіна, А.Чэхава, А.Блока, М.Горкага, Л.Талстога, У.Маякоўскага, П.Мерымэ і інш. У тэмпераментным выкананні Ж. спалучалася лірычная і гераічная накіраванасць. Дзярж. прэмія СССР 1949.

ЖУРАЎЛЁЎ Дзмітрый Мікалаевіч (20.5.1915, г. Жлобін Гомельскай вобл. — 1.3.1988), бел. музыказнавец, кантрабасіст. Засл. дз. культ. Беларусі (1968). Вучыўся ў Бел. кансерваторыі (1944—47). З 1931 у Бел. ансамблі нар. інструментаў і сімф. аркестры Бел. радыё, у 1937—60 (з перапынкам) у сімф. аркестры Бел. філармоніі, з 1956 рэдактар, у 1964—70 гал. рэдактар муз. вяшчання Бел. радыё. Аўтар даведнікаў «Кампазітары Савецкай Беларусі» (1966) і «Саюз кампазітараў БССР» (1978), біягр. нарысаў пра Л.Абеліёвіча, М.Аладава, Г.Вагнера, Дз.Лукаса, І.Любана, П.Падкавырава, Р.Пукста, Ю.Семяняку, А.Туранкова, Я.Цікоцкага, М.Чуркіна, творчых партрэтаў майстроў сцэны, у т.л. Л.Александроўскай, З.Бабія, С.Данілюк, М.Дружыны, С.Друкер, М.Зюванава, В.Мальковай, В.Чарнабаева, больш за 300 муз. тэле- і радыёперадач.

Т.Б.Варфаламеева.

ЖУРАЎЛЁЎСКАЕ БАЛО́ТА, у Докшыцкім і Глыбоцкім р-нах Віцебскай вобл., пераважна ў вадазборы вярхоўяў р. Бярэзіна. Нізіннага (85%), вярховага (13%), мяшанага тыпаў. Пл. 18,2 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 14,2 тыс. га. Глыб. торфу да 6 м, сярэдняя 2 м. Ёсць сапрапель магутнасцю да 2,1 м, мергель — да 1,6 м. Балота часткова асушана, выкарыстоўваецца пад сенажаць. Большая ч. балота пад лесам (хвоя, бяроза, вольха).

ЖУРАЎЛІ́ сапраўдныя (Grus), род птушак сям. журавіных атр. журавелепадобных. 10 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Амерыцы, Аўстраліі і Новай Гвінеі. Насяляюць пераважна адкрытыя мясціны: стэпы, вял. балоты, тундру. Селяцца парамі, у час пралёту і зімоўкі аб'ядноўваюцца ў чароды. Найб. вядомы Ж.: шэры (Grus grus), канадскі (G. canadensis), белы, або стэрх (G. leucogeranus), амерыканскі (G. americana), японскі (G. japonensis). 6 відаў і 2 падвіды занесены ў Чырв. кнігу МСАП. Існуе Міжнар. фонд аховы журавёў (ЗША). На Беларусі 1 від — журавель шэры, трапляецца ўсюды, занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. 80—152 см, выш. каля 2 м, маса 3—12 кг. Апярэнне пераважна шчыльнае, шараватае, буравата-чорнае ці белае. Шыя і ногі доўгія, хвост кароткі. У палёце выцягваюць шыю і ногі. Большасць Ж. выдае гучны трубны крык (рэзанатар — падоўжаная трахея). Нясуць 1—2 (радзей 3) яйцы. Корм раслінны і жывёльны.

ЖУРА́ЎНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Нача, за 30 км на ПдЗ ад Полацка. Пл. 0,49 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. 720 м, найб. глыб. 14 м, даўж. берагавой лініі 5,8 км. Пл. вадазбору 6,9 км^2. Схілы катлавіны выш. да 20 м (на З і ПдЗ 2—5 м), разараныя, месцамі парослыя лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, пад хмызняком, на ПдЗ сплавінныя. Дно да глыб. 5—6 м пясчанае, ніжэй глеістае. Зарастае. Злучана ручаямі з азёрамі Вальнец і Сушына.

ЖУРА́ЎСКІ Аркадзь Іосіфавіч (н. 5.8.1924, в. Янава Талачынскага р-на Віцебскай вобл.), бел. мовазнавец. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1980). Д-р філал. н. (1968), праф. (1970). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыў БДУ (1950). З 1950 працуе ў Ін-це мовазнаўства Нац. АН Беларусі (у 1983—89 дырэктар). Даследуе гісторыю бел. мовы і

А.І.Жураўскі.

бел. мовазнаўства. Аўтар прац «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» (т. 1, 1967), «Мова нашых продкаў» (1983). Сааўтар даследаванняў «Гістарычная лексікалогія беларускай мовы» (1970), «Гістарычная марфалогія беларускай мовы» (1979), «Мова беларускай пісьменнасці XIV—XVIII стст.» (1988),

Журавлі: 1 — шэры; 2 — стэрх; 3 — амерыканскі; 4 — японскі.

«Мова выданняў Францыска Скарыны» (1990), дапаможнікаў для ВНУ «Нарысы па гісторыі беларускай мовы» (1957), «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» (ч. 1—2, 1961—62) і інш. Адзін са стваральнікаў «Руска-беларускага слоўніка грамадска-палітычнай тэрміналогіі» (1970) і гал. рэдактар «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» (вып. 1—14, 1982—96). Дзярж. прэмія Беларусі 1994 (за комплекс прац ў галіне скарыназнаўства). *І.К.Германовіч.*

ЖУРА́ЎСКІ Генадзь Іванавіч (н. 8.1.1951, в. Маршчынавічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне цеплафізікі. Д-р тэхн. н. (1993). Скончыў БДУ (1973). З 1973 у Акад. навук. комплексе «Ін-т цепла- і масаабмену» Нац. АН Беларусі. Навук. працы па цепламасаперанос пры фазавых і хім. пераўтварэннях у дысперсных і сітаватых асяроддзях. Распрацаваў цеплафіз. асновы экалагічна чыстых працэсаў тэрмічнай апрацоўкі дысперсных і сітаватых матэрыялаў.

Тв.: Тепломассоперенос в многофазных системах. Мн., 1990 (разам з В.Л.Ганжой, Э.М.Сімкіным).

ЖУРА́ЎСКІ Дзмітрый Пятровіч (1810, Магілёўская губ. — 23.11.1856), расійскі эканаміст, статыстык. Скончыў Пецярбургскі кадэцкі корпус (1829). З 1831 працаваў у камісіі М.М.Спяранскага па складанні Збору законаў Рас. імперыі. З 1845 у Кіеве на стат. рабоце. Распрацаваў сістэму стат. паказальнікаў для вывучэння з'яў грамадскага жыцця, а таксама праграму даследавання прадукц. сіл Расіі. Пры вывучэнні сац. з'яў прытрымліваўся канцэпцыі падзелу грамадства на асобныя класы і групы, неабходнасці забеспячэння росту нар. дабрабыту. Аўтар прац «Аб крыніцах і выкарыстанні статыстычных звестак» (1846), «Статыстычнае апісанне Кіеўскай губерні» (т. 1—3, 1852).

ЖУРБА́ Янка (сапр. І в а ш ы н Іван Якаўлевіч; 30.4.1881, в. Купніна, цяпер у межах г. Чашнікі Віцебскай вобл. — 7.1.1964), бел. паэт. Скончыў Глухаўскі настаўніцкі ін-т (1909). Настаўнічаў на Украіне і ў Беларусі. З 1902 друкаваў этнагр. нарысы ў газ. «Витебские губернские ведомости». Першы верш на бел. мове «На беразе Дзвіны» апубл. ў 1909 у «Нашай ніве». У лепшых вершах зб. «Заранкі» (1924), «Ясныя шляхі» (1959) — лірызм, нар.-песенныя матывы, некаторыя залішне рацыяналістычныя. Для дзяцей напісаў кнігі «Ластаўкі» (1950), «Сонечная раніца» (1955), «Светлыя дні» (1959).

Тв.: Вершы. Мн., 1970; Роднае. Мн., 1980; Мая песня. Мн., 1984.

ЖУРДА́Н (Jourdan) Жан Батыст (29.4.1762, г. Ліможа, Францыя — 23.11.1833), французскі ваен. дзеяч. Маршал Францыі (1804). Граф (1816). У 1779—83 удзельнічаў у вайне за незалежнасць ЗША. У Франц. рэвалюцыю 1789—99 камандаваў батальёнам валанцёраў (з 1791), корпусам, арміяй (з 1793); перамог аўстр. войскі пры Флёрусе (1794). Ініцыятар закону аб канскрыпцыі (воінскай павіннасці). У час перавароту *Васемнаццатага брумера* 1799 выступіў супраць Напалеона Банапарта, пасля падтрымаў яго. У 1804—05 камандуючы Італьян. арміяй, у 1806—09 і 1812—13 ваен. саветнік і нач. штаба ісп. караля Жазефа Банапарта. З 1814 на службе ў *Бурбонаў*, камандаваў ваен. акругай. З 1819 чл. палаты пэраў.

Я.Журба.

В.А.Жучкевіч.

ЖУ́РЖАЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА ГЛІН, каля паўночна-ўсх. ускраіны Віцебска. Пластападобны паклад звязаны з азёрна-ледавіковымі адкладамі паазерскага зледзянення. Гліны чырвона- і цёмнабурыя стужачныя, пластычныя, шчыльныя, карбанатныя. Разведаныя запасы 9,6 млн. м^3, перспектыўныя 1,4 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,4—8 м, ускрышы 0,2—6,3 м. Гліны прыдатныя на выраб керамзіту, дрэнажных труб, цэглы. *А.П.Шчураў.*

«ЖУРНА́Л МИНИСТЕ́РСТВА НАРО́ДНОГО ПРОСВЕЩЕ́НИЯ», часопіс Міністэрства нар. асветы Расіі. Выдаваўся ў 1834—1917 у Пецярбургу на рус. мове. Змяшчаў матэрыялы мін-ва (афіц. частка) і артыкулы па нар. асвеце, класічнай філалогіі, гісторыі, л-ры і фальклоры (неафіц. частка). З публікацыямі пра Беларусь выступалі М.В.Доўнар-Запольскі, Ф.І.Леантовіч, П.М.Жуковіч, Я.Ф.Карскі, М.П.Шпілеўскі і інш. У часопісе змешчаны рэцэнзіі на працы М.Я.Нікіфароўскага, Е.Р.Раманава, М.Федароўскага, П.В.Шэйна і інш. У 1837—55 друкаваў «Паказальнік новых кніг», што дало пачатак дзярж. бібліягр. рэгістрацыі. *Г.А.Пятроўская.*

«ЖУРНА́Л ОТДЕ́ЛА НАРО́ДНОГО ОБРАЗОВА́НИЯ ЗА́ПАДНОЙ О́БЛАСТИ», навукова-педагагічны часопіс. Орган аддзела нар. асветы Зах. вобласці. Выдаваўся ў 1918 у Смаленску на рус. мове 1 раз у тыдзень. Друкаваў урадавыя распараджэнні, загады Нар. камісарыята асветы РСФСР і аддзела нар. асветы Зах. вобласці. Змяшчаў планы, справаздачы і агляды дзейнасці аддзела і яго падраздзяленняў: тэзісы пра дашкольнае выхаванне, прынятыя на Віцебскім губ. з'ездзе настаўнікаў (7.4.1918), справаздачу пра дзейнасць школьнага і план работы дашкольнага пададдзелаў; агляд дзейнасці ўстаноў і грамадскіх арг-цый Зах. вобласці па ахове помнікаў старажытнасці, іх даследаванні. Сярод публікацый артыкулы пра дашкольнае выхаванне і пазашкольную работу, пра рэформу пач. і сярэдняй школ. Знаёміў з новай л-рай па нар. асвеце. Выйшла 10 нумароў.

У.У.Грамовіч.

«ЖУРНА́Л ПРИКЛАДНО́Й СПЕКТРОСКОПИ́И», міжнародны штомесячны навук. часопіс. Выдаецца Нац. АН Беларусі з 1964 у Мінску на рус. мове. З 1965 перавыдаецца ў Нью-Йорку на англ. мове («Journal of Applied Spectroscopy»). Асн. навук. кірункі: фіз. асновы і метады атамнага і малекулярнага спектральнага аналізу; нелінейная оптыка і лазеры; спектраскапія рассейвальнага асяроддзя і цвёрдых цел; спектраскапія газаў і плазмы; спектральная апаратура і метады вымярэнняў; матэм. метады і выкарыстанне ЭВМ у спектраскапіі. Гал. рэдактары: Б.І.Сцяпанаў (1964—87), В.С.Буракоў (з 1988), Г.П.Гурыновіч (з 1992), М.А.Барысевіч (з 1994). *М.М.Зубарава.*

ЖУРНАЛІ́СТЫКА (ад франц. journal газета), від творчай дзейнасці грамадскага кірунку па зборы, апрацоўцы і распаўсюджванні актуальных паведамленняў і звестак, праз сродкі масавай інфармацыі (СМІ) — друк, радыё, тэлебачанне, кіно і інш. Уключае таксама навуку пра ролю і месца СМІ у жыцці грамадства, пра формы і метады журналісцкай дзейнасці. Вызначаецца аператыўнасцю і перыядычнасцю, абапіраецца на юрыд. законы і маральна-этычныя нормы, развіваецца па ўласных прынцыпах і законах. Праз СМІ выконвае інфарм. функцыі, уздзейнічае на грамадскую думку, на светапогляд чалавека. Функцыі і задачы Ж. ў розны гіст. перыяд мяняліся. У залежнасці ад канкрэтных задач (публіцыстычных, мастацкіх, навуковых, прафесійных і інш.) Ж. ўласціва шматгаліновасць.

Ж. ўзнікла ў пач. 17 ст. (гл. *Газета, Часопіс*). Першыя рэгулярныя масавыя перыяд. выданні з'явілася ў 2-й пал. 18 ст. У 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. з вынаходствам фатаграфіі і кінематографа з'явілася фота- і кінажурналістыка, з 1920-х г. развіваецца радыёжурналістыка, з 1940-х г. — тэлежурналістыка. У сучаснай Ж. важную ролю адыгрываюць дзярж. і прыватныя сродкі масавай інфармацыі. Спецыфіка Ж. патрабуе высокакваліфікаваных прафес. кадраў. На Беларусі журналісцкую адукацыю атрымліваюць на ф-це журналістыкі БДУ (з 1944), дзе найб. актыўна займаюцца таксама яе навук. і практ. праблемамі. З 1946 дзейнічае *Міжнародная арганізацыя журналістаў*, з 1959 Бел. саюз журналістаў (гл. *Саюз журналістаў Беларусі*). Лепшыя работы ў галіне Ж. на Беларусі адзначаюцца Дзярж. прэміяй (з 1967; да 1991 імя П.М.Лепяшынска-

га). Вывучэнню праблем гісторыі, тэорыі і практыкі Ж. на Беларусі прысвечаны працы С.Х.Александровіча, Р.В.Булацкага, С.В.Говіна, С.В.Марцэлева, І.І.Сачанкі, Б.В.Стральцова, М.Я.Цікоцкага і інш. даследчыкаў. Выходзілі і выходзяць выданні, прысвечаныя журналісцкай дзейнасці, — «Рабселькор» (1931—33), «У дапамогу работнікам мясцовага друку», «Культура мовы журналістаў» (вып. 1—6, 1982—92), «Веснік БДУ» (серыя IV, з 1969) і інш., выдаюцца зборнікі, манаграфіі і інш. даследаванні.

Літ.: Цікоцкі М.Я. З гісторыі беларускай журналістыкі XIX ст. Мн., 1960; Марцелев С.В. Печать Советской Белоруссии. Мн., 1967; Стральцоў Б.В. Публіцыстыка. Жанры. Майстэрства. Мн., 1977; Булацкі Р.В., Сачанка І.І., Говін С.В. Гісторыя беларускай журналістыкі. Мн., 1979; Орлова Т.В. Введение в журналистику. Организация работы редакции газеты. Мн., 1989.

С.В.Говін.

ЖУРУА́ (Juruá), рака на З Бразіліі (вярхоўі ў Перу), правы прыток р. Амазонка. Даўж. 3280 км, пл. бас. 224 тыс. км^2. Пачынаецца ў адгор'ях Перуанскіх Андаў (Мантанья), сярэдняе і ніжняе цячэнні па Амазонскай нізіне ў звілістым рэчышчы. Жыўленне дажджавое. Паводкі са снеж. да мая. Сярэдні гадавы расход вады каля 9000 м^3/с. Суднаходная ад г. Крузейру-ду-Сул (Бразілія).

ЖУРЧА́ЛКІ, кветкавыя мухі (Syrphidae), сямейства насякомых падатр. караткавусых круглашыўных атр. двухкрылых. Каля 4 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках. Найб. трапляюцца каля вады на кветках, травяністых раслінах, лісці дрэў і інш. На Беларусі найб. вядомыя Ж.: бугрыстая (Eumerus tuberculatus), цыбульная (E. strigatus), чмелявідка празрыстая (Volucella pelluceus), шараноска (Sphaerophoria scripta).

Журчалкі: 1 — цыбульная; 2 — чмелявідка празрыстая; 3 — перавязаная; 4 — чмелепадобная; 5 — вісячая; 6 — лабастая.

Даўж. 5—15 мм, радзей да 25 мм. Цела часта яркае афарбаванае; многія вонкавым выглядам нагадваюць джалячых перапончатакрылых — пчол, вос, чмялёў. Крылы празрыстыя з 3 радыяльнымі жылкамі. Вусікі 3-членікавыя. Вочы самцоў пераважна судакранаюцца, самак падзелены лбом. Добра лётаюць. Развіццё з поўным ператварэннем. Лічынкі жывуць у сцёкавых водах, гноі, у гнёздах пчол, мурашак і інш. Лічынкі — драпежнікі, дэтрытафагі, раслінаедныя. Дарослыя кормяцца нектарам кветак. Апыляльнікі раслін.

ЖУРЫ́ (англ. і франц. jury ад лац. juro прысягаю), 1) група спецыялістаў, якая прысуджае ўзнагароды і прэміі на конкурсах, выстаўках, спаборніцтвах і інш. 2) У Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША і некат. інш. краінах калегія прысяжных (непрафесіянальных суддзяў), якія ўдзельнічаюць у разглядзе крымін. і грамадз. спраў.

ЖУТАÍ (Jutaí), рака на З Бразіліі, правы прыток р. Амазонка. Даўж. 1200 км, пл. бас. 60 тыс. км^2. Цячэ па Амазонскай нізіне ў вельмі звілістым рэчышчы. Жыўленне дажджавое. Паводкі з сак. да чэрвеня. Сярэдні гадавы расход вады 2400 м^3/с. Суднаходная ў ніжнім цячэнні.

ЖУЧКЕ́ВІЧ Вадзім Андрэевіч (19.11.1915, г.п. Лоеў Гомельскай вобл. — 28.2.1985), бел. географ. Д-р геагр. н. (1971), праф. (1972). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1977). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1939). Працаваў у сістэме нар. асветы і вышэйшай адукацыі. З 1964 у БДУ (з 1976 заг. кафедры). Асн. працы па тапаніміцы, эканам. геаграфіі, методыцы выкладання геаграфіі. Аўтар «Кароткага тапанімічнага слоўніка Беларусі» (1974).

Тв.: Топонимика Белоруссии. Мн., 1968; Общая топонимика. 3 изд. Мн., 1980.

ЖУЧКО́Ў Ціхан Свірыдавіч (4.7.1922, в. Бахацец Чавускага р-на Магілёўскай вобл. — 9.3.1987), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Магілёўскі аэраклуб (1941), Ейскае ваенна-марское авіяц. вучылішча (1942). У Вял. Айч. вайну лётчык-знішчальнік ВПС Балтыйскага флоту ст. лейт. Ж. вызначыўся ў час прарыву блакады Ленінграда, вызвалення Ленінградскай вобл. і Прыбалтыйскіх рэспублік. Зрабіў 257 баявых вылетаў, з іх 85 на фотаразведку, асабіста збіў 11 самалётаў праціўніка. Да 1960 у Сав. Арміі, пасля ў Мін-ве грамадз. авіяцыі.

ЖУЧЭ́НКА Аляксандр Аляксандравіч (н. 25.9.1935, г. Есентукі, Расія), малдаўскі генетык. Акад. АН Малдовы (1976). Чл.-кар. Расійскай АН (1973). Скончыў Вышэйшы с.-г. ін-т імя В.Каларава (1960; Балгарыя). З 1960 у Малдаўскім НДІ арашальнага земляробства і агародніцтва (у 1967—76 дырэктар). У 1977—89 прэзідэнт АН Малдовы. Навук. працы па прыкладной генетыцы і тэарэт. асновах селекцыі с.-г. раслін (пытанні генетыкі памідораў, генетыка-біяхім. прыроды ўстойлівасці агародніных культур да захворванняў, выкарыстання матэм. метадаў для прагназавання гетэрозісу).

Тв.: Генетика томатов. Кишинев, 1973

ЖЫ́ВА, у славянскай міфалогіі гал. жаночае бажаство, багіня жыцця і ўрадлівасці, дачка язычніцкага бога Траяна. Як увасабленне жыццёвай сілы прыпастаўлялася смерці. У гонар Ж. высаджвалі сады, будавалі храмы.

ЖЫВАКІ́НІ Васіль Ігнатавіч (1805, Масква — 30.1.1874), расійскі акцёр. Сын італьянца і прыгоннай бел. балерыны П.Азарэвіч (гл. ў арт. *Азарэвічы*). Родапачынальнік сям'і рус. акцёраў Жывакіні. З 1825 у Малым т-ры (Масква). Вызначыўся як комік-буф у вадэвілях. Спалучаў прастату, натуральнасць выканання з яркай гратэскавасцю, буфанадай, імправізацыяй (часта сатырычнай). Лепшыя ролі: Жавіяль, Сінічкін («Страпчы пад сталом», «Леў Гурыч Сінічкін» Дз.Ленскага), Мардашоў («Аз і Ферт» П.Фёдарава). Выкарыстоўваў вадэвільныя прыёмы ў класічнай камедыі: Арган («Школа жонак» Мальера), Груміо («Утаймаванне свавольніцы» У.Шэкспіра), Падкалесін («Жаніцьба» М.Гогаля), Расплюеў («Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна) і інш.

ЖЫВАКО́СТ (Symphytum), род кветкавых раслін сям. бурачнікавых. Каля 30 відаў. Пашыраны ў Еўропе і Зах. Азіі. На Беларусі па берагах рэк, канаў, у алешніках, на сырых лугах звычайна трапляецца Ж. лекавы (S. officinale) і вельмі рэдка — Ж. данскі (S. tanaicense). З інтрадукаваныя віды: Ж. каўказскі (S. caucasicum), Ж. крымскі (S. tauricum) і Ж. цвёрды (S. asperum), вырошчваюцца як кармавыя расліны.

Жывакост лекавы.

Шматгадовыя буйныя, апушаныя, травяністыя расліны з тоўстымі галінастымі амаль чорнымі каранямі і суцэльным цвердаватым лісцем. Кветкі двухполыя, правільныя, пурпурова-фіялетавыя, ружова-чырвоныя, з трубчаста-званочкавым вяночкам, у панік-

лых, густааблісцелых завітках. Плод — чатырохарэшак. Лек. (вяжучая, супрацьзапаленчая, кроваспыняльная) і кармавая расліна.

ЖЫВАЛЕ́ЎСКІ Валерый Серафімавіч (н. 11.1.1961, г. Гродна), бел. гітарыст, педагог; адзін з пачынальнікаў бел. гітарнай школы. Скончыў Гродзенскае муз. вучылішча (1980), Бел. кансерваторыю (1985). Удасканальваўся ў Маскоўскім дзярж. муз.-пед. ін-це імя Гнесіных (1989). З 1989 выкладчык Бел. акадэміі музыкі. У рэпертуары старадаўняя лютневая і гітарная бел. музыка, п'есы кампазітараў-класікаў (у т.л. ва ўласных транскрыпцыях і апрацоўках), творы бел. аўтараў (Г.Гарэлавай, В.Войціка, Я.Паплаўскага). Аўтар артыкулаў пра бытаванне лютні і гітары на Беларусі, аўтар і складальнік нотных зборнікаў «Альбом юнага гітарыста» (1994), «Беларуская гітарная музыка» (1995), «Гітара ў ансамблі» (1997). Стварыў шмат запісаў на радыё. Лаўрэат 7-га Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1983). Сярод яго вучняў лаўрэаты міжнар. і нац. конкурсаў У.Захараў, Ф.*Волкаў*, В.Тарлецкі.

ЖЫВАНАРАДЖЭ́ННЕ, вівіпарыя, спосаб узнаўлення патомства, пры якім зародак развіваецца ў матчыным арганізме, атрымлівае непасрэдна ад яго пажыўныя рэчывы і нараджаецца ў выглядзе дзіцяняці або лічынкі, вызваленых ад абалонак яйца. Уласціва шэрагу беспазваночных (некат. кішачнаполасцевым, членістаногім, малюскам, чарвям), пазваночным (некат. рыбам, земнаводным, паўзунам, млекакормячым жывёлам) і чалавеку. Пра Ж. ў раслін гл. *Жывародныя расліны*.

ЖЫВАПІС, від выяўленчага мастацтва, творы якога ствараюцца спосабам нанясення колераных матэрыялаў на якую-небудзь цвёрдую аснову; адлюстроўвае рэчаіснасць, пераасэнсаваную творчай фантазіяй мастака як вынік эстэт. асвоення свету. У залежнасці ад прызначэння твора, пануючага маст. стылю (готыка, рэнесанс, класіцызм, рэалізм і інш.), індывідуальнасці мастака Ж. дае ацэнку духоўнаму зместу эпохі і з'яўляецца дзейсным сродкам эстэт. выхавання грамадства. Як высокаразвітая форма чалавечай дзейнасці з'яўляецца сферай стварэння маст. каштоўнасцей.

Вызначальная спецыфічная асаблівасць Ж. — шматбаковае выкарыстанне выяўл. магчымасцей *колеру* для стварэння гарманічна цэласнай сістэмы (*каларыту*). Звычайна ўжываецца шэраг узаемазвязаных колераў і іх адценняў (*гама колеравая*), але існуе і Ж. адценнямі аднаго колеру (*манахраматызм*). З дапамогай колеру, *малюнка*, *кампазіцыі*, фактуры Ж. стварае маст. вобразы, якія могуць узнаўляць матэрыяльнасць свету, плоскаснасць і перспектыву прасторы, ствараць ілюзію руху, адлюстроўваць жывую прыроду ці

Да арт. **Жывапіс**. Невядомы мастак. Партрэт Аляксандра Астрожскага. 1660—70-я г.

адасобленыя ідэі (*алегорыя*, *сімвал*). Па сукупнасці матэрыялаў і тэхніцы іх выкарыстання вылучаюць *алейны жывапіс*, *тэмперу*, *васковы жывапіс*, *фрэску*, *а сэка* і інш. Часам для выканання жывапісных работ выкарыстоўваюць *акварэль*, *гуаш*, *эмаль*, *пастэль*, *туш*. Непасрэдна з Ж. звязаны *вітраж*, *мазаіка*, *панарама* і *дыярама*. Залежна ад прызначэння, характару вобразаў і выканання адрозніваюць *манументальны жывапіс*, станковы Ж. (*карціна*, *абраз*, гл. *Станковае мастацтва*), *дэкаратыўны жывапіс*, *мініяцюру*, дэкарацыйны Ж. (гл. *Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва*). Паводле тэматыкі і прадметаў адлюстравання Ж. падзяляецца на жанры: *гістарычны жанр*, *бытавы жанр*, *анімалістычны жанр*, *батальны жанр*, *партрэт*, *пейзаж*, *нацюрморт* і інш. Па тэхніцы пісьма адрозніваюць Ж. шматслаёвы (з *падмалёўкамі* і *лесіроўкамі*) і Ж. у адзін прыём (альпрыма).

Да арт. **Жывапіс**. А.Дзюрэр. Чатыры апосталы. 1526.

Да арт. **Жывапіс**. І.Хруцкі. Партрэт невядомай. 1830-я г.

Да арт. **Жывапіс**. Э.Дэга. Жанчына расчэсвае валасы. Каля 1883.

Да арт. **Жывапіс**. Р.Дэланэ. Даніна павагі Блерыо. 1914.

Да арт. **Жывапіс**. П.Сергіевіч. Партызан Федзя. 1943.

Ж. узнік у эпоху позняга палеаліту (40—8 тыс. г. назад). Захаваліся наскальныя размалёўкі (Пд Францыі, Пн Іспаніі і інш.) — выкананыя вохрамі, сажай і вуглем абстрактныя абагульненыя выявы асобных жывёл, пазней і сцэн палявання. Ж. рабаўладальніцкага грамадства валодаў развітой вобразнай сістэмай, багатымі тэхн. сродкамі (гл. раздзелы па мастацтве ў аўт. *Егіпет* Старажытны, *Індыя*, *Кітай*, *Антычнае мастацтва*). У сярэдневякоўі ў Еўропе дамінаваў рэлігійны Ж. (гл. *Іканапіс*), які часам змяшчаў і гіст. сюжэты. Ж. *Адраджэння* сцвярджаў агульныя прынцыпы новага гуманіст. мастацтва (Рафаэль, Мікеланджэла, Леанарда да Вінчы, А.Дзюрэр, Я. ван Эйк і інш.). У 17—18 ст. працэс развіцця еўрап. Ж. ўскладніўся. Пачалі складвацца нац. школы ў Францыі (Ж. дэ Латур, Н.Пусэн, Ж.Л.Давід), у Італіі (М.Караваджа, П'етра да Картона, Дж.Цьепала), Іспаніі (Эль Грэка, Д.Веласкес, Ф.Сурбаран, Ф.Гоя), Фландрыі (П.П.Рубенс, Я.Іорданс, А. ван Дэйк), Галандыі (Ф.Халс, Рэмбрант, Я.Вермер), Англіі (Т.Гейнсбара, У.Хогарт), Расіі (Ф.Рокатаў, Дз.Лявіцкі, У.Баравікоўскі). Пашырылася і сістэма жанраў, паглыбілася псіхалагічная праблематыка. Сфарміраваліся розныя жывапісныя сістэмы з агульнымі стылявымі прыкметамі (дынамічны Ж. *барока* з характэрнай незамкнутай, спіралепадобнай кампазіцыяй; Ж. *класіцызму* з дакладным, строгім і ясным малюнкам; Ж. *ракако* з гульнёй вытанчаных нюансаў колеру, светлых і бляклых тонаў) і не акрэсленыя стылявымі рамкамі. Развіліся больш камерныя, тонкія тэхнікі Ж. (пастэль, акварэль, партрэтная мініяцюра). У 19 ст. склалася нац. школа Ж. ў Амерыцы (гл. ў арт. *Злучаныя Штаты Амерыкі*). Пашырыліся маст. сувязі паміж Еўропай і інш. часткамі свету, вынікам чаго стаў пэўны ўзаемаўплыў Ж. розных рэгіёнаў. У канцы 19 ст. ў барацьбе з познім класіцызмам, *акадэмізмам* і *натуралізмам* склаўся Ж. *рамантызму* з яго актыўнай цікавасцю да драм. падзей гісторыі і сучаснасці, насычанасцю каларыту (Т.Жэрыко, Э.Дэлакруа, А.Іванаў). Ж. рэалізму імкнуўся да дакладнага, перакананчага адлюстра-

Да арт. **Жывапіс**. В.Цвірка. Збажына ўбрана. 1972.

Да арт. **Жывапіс**. В.Бялыніцкі-Біруля. Блакітнай вясною. 1952.

вання жыцця (Дж.Констэбл, К.Каро, А.Дам'е). Для сцвярджэння рэаліст. Ж. Расіі вял. значэнне мела Т-ва перасоўных мастацкіх выставак (гл. *Перасоўнікі*). У развіцці каларызму і пленэрнага Ж. важную ролю адыграў *імпрэсіянізм* (Э.Дэга, А.Рэнуар, К.Манэ і інш.). У канцы 19 — пач. 20 ст. характар Ж. стаў асабліва складаным і супярэчлівым: суіснавалі, узаемаўплывалі і змагаліся паміж сабою разнастайныя рэаліст. і авангардысцкія плыні (*фавізм*, *футурызм*, *лучызм*, *кубізм*, *мадэрн*, *абстракцыянізм* і інш.), што выявілася ў творчасці буйнейшых мастакоў таго часу: П.Пікасо, А.Матыса, Ф.Лежэ, Р.Дэланэ ў Францыі; Д.Рыверы, Д.Сікейраса ў Мексіцы; Р.Гутуза ў Італіі; Дж.Полака ў ЗША. У 1940—50-я г. ў зах.-еўрап. і амер. мастацтве найб. распаўсюджаным стылем быў *сюррэалізм*, які да 1960-х г. саступіў лідэрства *поп-арту*. З канца 1960-х г. Ж. актыўна развіваецца ў напрамках *опарта*, *кінетычнага мастацтва*, *гіперрэалізму* і інш., а таксама ў рэаліст. кірунку.

На Беларусі Ж. вядомы з 11—12 ст. Ён развіваўся як самабытная з'ява ў рэчышчы мастацтва ўсх. славян пад уплывам візантыйскага і зах.-еўрап. (фрэскі *Полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай царквы*, мініяцюры *Тураўскага евангелля*, *Аршанскага евангелля*). Твораў станковага Ж. таго перыяду практычна не захавалася. У пач. 16 ст. склалася *беларуская іканапісная школа*; паступова ў рэліг. кампазіцыі сталі пранікаць гіст. сюжэты, выявы фундатараў і інш., вызначылася тэндэнцыя да развіцця свецкага Ж. Канец 16—18 ст. пазначаны росквітам параднага, т. зв. сармацкага, партрэта (партрэт Аляксандра Астрожскага невядомага мастака. 17 ст.). У канцы 18—19 ст. ў бел. Ж. дамінавалі класіцызм і рамантызм (творы І.Аляшкевіча, В.Ваньковіча, Я.Дамеля, Я.Сухадольскага). Пашырыліся жанры пейзажа (творчасць В.Дмахоўскага, К.Русецкага, Ф.Смуглевіча), нацюрморта, які ўводзіўся і ў інш. жанры (І.Хруцкі). Вял. ролю ў развіцці бел. Ж. адыгралі *Віленская мастацкая школа* і Пецярбургская АМ. У 2-й пал. 19 ст. пад уплывам рус. мастацтва развіліся тэндэнцыі крытычнага рэалізму («На этапе» К.Альхімовіча, «Салдат з хлопчыкам» Н.Селівановіча і інш.). У канцы 19 — пач. 20 ст. самым пашыраным жанрам стаў пейзаж (творы В.Бялыніцкага-Бірулі, Ф.Рушчыца), які вылучаўся высокай самабытнай культурай

Да арт. **Жывапіс**. Ф.Янушкевіч. Роздум (партрэт Цёткі). 1976.

Да арт. **Жывапіс**. Р.Таболіч. Калодзеж. 1981.

Да арт. **Жывапіс**. У.Маскоўскіх. Збожжа ўбрана. 1983.

Да арт. **Жывапіс**. Г.Вашчанка. Балада аб мужнасці. 1974.

Да арт. **Жывапіс**. Л.Шчамялёў. Івянецкія лыны. 1977.

каларыту. Жывапісныя творы прадстаўнікоў дэмакр. кірунку мелі яскрава выражаны сац. характар («Зямля» і «Эмігранты» Рушчыца, «Шэсце навальніцы» К.Стаброўскага і інш.). Для творчасці мастакоў 1920—30-х г. характэрна актыўнае пераасэнсаванне асн. еўрап. стыляў і накірункаў, пошукі нац. стылістыкі і палітры (Бялыніцкі-Біруля, Я.Драздовіч, У.Кудрэвіч, Ю.Пэн, П.Сергіевіч, М.Сеўрук, М.Станюта, М.Філіповіч, М.Шагал; дзейнасць *Віцебскага народнага мастацкага вучылішча*). З канца 1930-х г. у бел. Ж. склаўся метад т. зв. сацрэалізму, асн. прыкметамі якога сталі рэаліст. трактоўка дэталей, спрошчаная ідэалізацыя тыпажу, гераізацыя рэв. гісторыі і сучаснасці, паліт. ангажыраванасць. У гады Вял. Айч. вайны ў Ж. пераважалі сюжэтна-тэматычная карціна, батальны і партрэтны жанры (творы Я.Зайцава, Сергіевіча, У.Сухаверхава, В.Волкава, А.Шыбнёва). Тэма вайны і яе эмацыянальнае асэнсаванне дамінавалі да канца 1950-х г. Своеасаблівасць бел. прыроды паказана ў творах Бялыніцкага-Бірулі. У 1960-я г. ў бел. Ж. пераважаў т. зв. суровы стыль, якому ўласцівы абагульненасць форм, манументальнасць і сімвалічнасць вобразаў, някідкі каларыт (творы Г.Вашчанкі, В.Грамыкі, М.Савіцкага і інш.). З 2-й пал. 1970-х г. узнікла цікавасць да нац. гісторыі, нар. спадчыны. Пашырылася стылістычная і жанравая разнастайнасць. Бел. асветнікам, дзеячам культуры і гісторыі прысвячалі свае творы Вашчанка, А.Марачкін, Г.Скрыпнічэнка, Ф.Янушкевіч; завершанасцю і эмацыянальнай змястоўнасцю вылучаюцца пейзажы П.Масленікава, І.Рэя, В.Цвіркі, Л.Шчамялёва, У.Маскоўскіх, творы Р.Таболіча, М.Апіёка; самабытны характар бел. нацюрморта выяўлены ў творчасці В.Жолтак, В.Свентахоўскай. З сярэдзіны 1980-х г. як альтэрнатыва афіцыйнаму мастацтву ўзнік андэрграўнд, у якім тэмай Ж. з'яўляліся самі выяўл. сродкі. Для Ж. пачатку 1990-х г. характэрны разнапланавасць кірункаў, імкненне да сінтэзу жанраў і стылістыкі як сродку абнаўлення маст. мовы (М.Селяшчук, А.Задорын, Л.Хобатаў, В.Захарынскі, Р.Заслонаў і інш.). Важную ролю ў развіцці бел. школы Ж. адыграла адкрыццё ў 1947 Мінскага маст. вучылішча, у 1953 — маст. ф-та Бел. тэатр.-маст. ін-та (з 1991 БелАМ). Іл. гл. таксама да арт. *Іканапіс, Беларуская іканапісная школа, Манументальны жывапіс, Станковае мастацтва, Тэатральна-дэкаратыўнае мастацтва*, а таксама да арт. пра асобныя стылі і жанры мастацтва.

Літ.: Всеобщая история искусств. Т. 1—6. М., 1956—66; Ильина Т.В. История искусств: Западноевроп. искусство. 2 изд. М., 1993; Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1—6. Мн., 1987—94. *С.У.Пешын.*

Да арт. **Жывапіс**. М.Апіёк. Расчыненае акно. 1986.

Да арт. **Жывапіс**. М.Селяшчук. Люблю цябе сустракаць. 1994.

ЖЫВАПІ́СЕЦ (лац. Pictor), сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркая зорка 3,3 візуальнай *зорнай велічыні*. На тэр. Беларусі не відаць. Гл. *Зорнае неба*.

ЖЫВАРО́ДКІ, лужанкі (Viviparidae), сямейства *бруханогіх малюскаў* падкл. пярэдняшчэлепных. 6 відаў. Пашыраны ўсюды (акрамя Паўд. Амерыкі) у прэсных вадаёмах. На Беларусі 2 віды Ж.: рачная, або звычайная (Viviparus viviparus), і азёрная (V. contectus). Жывуць на пясчаных або заглееных грунтах у прыбярэжнай зоне рэк і азёр.

Жыварodка балотная.

Цела ўкрыта ракавінай (выш. да 6 см) з 5—7 спіральнымі завіткамі, з цёмна-карычневымі палосамі, складаецца з галавы, тулава і нагі. Вусце ракавіны авальнае, зачыняецца рагавой накрыўкай. Раздзельнаполыя. Аплодненыя яйцы развіваюцца ў матцы, моладзь выходзіць цалкам сфарміраваная (адсюль назва). Кормяцца водарасцямі, рэшткамі раслін і жывёл. Ж. — пажыва для многіх бентасаедных рыб. Біял. ачышчальнікі вадаёмаў.

ЖЫВАРО́ДНЫЯ РАСЛІ́НЫ, расліны, у якіх на наземных органах (у кветках, суквеццях, пладах, на лісці) фарміруюцца невял. зялёныя раслінкі, клубеньчыкі, цыбулінкі, пупышкі і інш., што потым падаюць на зямлю і развіваюцца ў новую асобіну. Пашыраны пераважна ў тундрах, стэпах, на высакагорных альпійскіх лугах, дзе расліны за кароткі вегетацыйны перыяд не могуць прайсці поўны цыкл развіцця і насенне не выспявае. На Беларусі з Ж.р. растуць метлюжок цыбульны, цыбуля (агародная, прычасночная, вінаградная), зубніца клубняносная, скочкі атожылкавыя; як лек. і дэкар. пакаёвую расліну вырошчваюць каланхоэ. Да Ж.р. належаць і многія насельнікі *мангравых лясоў*, у якіх насенне прарастае яшчэ ў няспелых пладах. У гэтай з'явы ёсць воўкавае падабенства з «прарастаннем на корані» збожжавых злакаў, у якіх пачынаюць расці спелыя зярняўкі, што страцілі фізіял. сувязь з мацярынскай раслінай.

ЖЫВАРО́ДНЫЯ РЫ́БЫ, рыбы, якія нараджаюць сфарміраваных малявак. Жыванараджэнне найб. уласціва акулам, скатам, галамянцы, марскому акуню і 4 сям. карпазубых, якія жывуць у трапічных і субтрапічных водах Паўд. і Паўн. Амерыкі, у т.л. і сям. Poecilidae, да якога належыць *гамбузія* і многія прадстаўнікі *акварыумных рыб* (гупі, мечаносцы, пецыліі, гірардынусы, малінезіі). Адрозніваюць уласна Ж.р., у якіх зародак злучаны з целам маці і корміцца за яго кошт (напр., у куніцавай акулы), і яйцажывародных, у якіх яйцы знаходзяцца ў целе маці, але з ім не злучаны і развіваюцца за кошт жаўтка (большасць Ж.р.). Апладненне ўнутранае, развіццё малявак адбываецца ў яечніках або ў відазмененых яйцаводах.

ЖЫВАРЭ́ЗКА, рака ў Магілёўскім р-не, правы прыток р. Лахва (бас. Дняпра). Даўж. 20 км. Пл. вадазбору 138 км^2. Пачынаецца на паўн. ўскраіне в. Куты. У верхнім цячэнні называецца *Сянна*.

ЖЫВАСЯЧЭ́ННЕ, гл. *Вівісекцыя*.

ЖЫВА́Я АГАРО́ДЖА, радавая пасадка з кустоў або дрэў са шчыльнымі густымі кронамі аднолькавай вышыні. У зялёным буд-ве Ж.а. выкарыстоўваюць для аховы дарог, зямельных участкаў, агароджвання жылой забудовы, афармлення прысад, бульвараў, сквераў, у паркавых і лесапаркавых кампазіцыях і інш. Яна павінна быць густой, аблісцелай па ўсёй вышыні, мець геаметрычна правільную форму. У дэкар. мэтах Ж.а. рэгулярна падстрыгаюць.

Высокімі (вышэй за 2,5 м) Ж.а., ці зялёнымі сценамі, выдзяляюць кампазіцыйныя цэнтры лесапаркаў, адмяжоўваюць паркі ад вуліцы або плошчы. Сярэднія (выш. 1—2,5 м) робяць у скверах і на бульварах. Нізкімі (ніжэй за 1 м), або бардзюрамі, афармляюць партэры, кветнікі, газоны, паркавыя дарожкі. На Беларусі для стварэння Ж.а. прыдатныя туя, елка звычайная, ліпа, граб, спірэі, барбарыс, біручына, глогі, самшыт і інш.

ЖЫВА́Я БАТЛЕ́ЙКА, батлея, выкананне асобных сцэн ці цэлых паказаў *батлейкі* жывымі ўдзельнікамі. Паказы

вольная карнавальная атмасфера, святочны вясёлы настрой удзельнікаў і гледачоў. П'еса «Цар Ірад» Ж.б. была

Жывародныя рыбы. Скаты: 1 — піла-рыба; 2 — хвастакол, або марскі кот; 3 — звычайны электрычны; 4 — вялікая галамянка. Акварыумныя рыбы: 5 — гупі; 6 — пецылія; 7 — малінезія (самка). Акулы: 8 — сіняя; 9 — тыгровая.

Ж.б. вядомы на Беларусі, Украіне (жывы вяртэп) і ў Польшчы. Належыць да каляднага цыкла нар. паказаў. Узніклі са спробы «ажывіць» асобныя батлеечныя сцэны, найчасцей самую папулярную «Мацей і доктар». У Ж.б. часам па традыцыі выкарыстоўвалі і ўласна батлейку: яе ўносілі і ставілі на стол у пачатку ці ў канцы паказу. Усяго ў паказах Ж.б. ўдзельнічала каля 10 персанажаў. У іх захоўвалася характэрная для Каляд і ўсяго гэтага цыкла асаблівая першай нар. драмай, на ўзор якой складзена папулярная нар. драма «Цар Максімілян». Гэта пацвярджае блізкасць паказаў лялечнай, Ж.б. і нар. драмы: формай, зместам і выканальніцтвам паказы пра цара Ірада і цара Максіміляна фактычна не адрозніваліся. *Дз.У.Стэльмах.*

«ЖЫВА́Я ГАЗЕ́ТА», тэатралізаваны паказ, заснаваны на паліт. газетным матэрыяле ці на мясц. надзённых фактах жыцця. Узнікла ў пач. 1920-х г. у клубнай маст. самадзейнасці Масквы з т.зв. «вуснай газеты» (чытанне ў голас інфарм. матэрыялаў з перыяд. друку). На ўзор «Ж.г.» ў далейшым складаліся праграмы «Сіняй блузы» (літ.-маст. мантаж, агляд, сатыр. сцэнкі, харавыя і танц. нумары). У пач. 20 ст. своеасаблівай «Ж.г.» была *Докшыцкая батлейка Патупчыка.*

«ЖЫВЁ БЕЛАРУ́СЬ!», часопіс. Орган *Саюза беларускай моладзі* (СБМ). Выдаваўся пры падтрымцы акупац. улад у ліп. 1943 — жн. 1944 у Мінску на бел. мове. Асвятляў мэты і задачы арг-цыі, палажэнні арганізац. і страявога статута СБМ, інфармаваў пра семінары, нарады і інспекцыйныя паездкі кіраўнікоў СБМ. Сярод публікацый нарысы па гісторыі Беларусі, вершы і песні бел. аўтараў, антысав. і антысеміцкая публіцыстыка. Выйшла 12 нумароў. *С.У.Жумар.*

ЖЫВЁЛАГАДО́ЎЛІ БЕЛАРУ́СКІ НДІ Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1949 (з 1961 у г. Жодзіна Мінскай вобл.) на базе аддзела жывёлагадоўлі Ін-та сацыяліст. сельскай гаспадаркі АН Беларусі. Асн. кірункі навук. даследаванняў: стварэнне высокапрадукцыйных пародаў, тыпаў, ліній с.-г. жывёлы; распрацоўка рэцэптаў камбікармоў і кармавых дабавак; удасканаленне тэхналогій кармлення, утрымання і ўзнаўлення с.-г. жывёлы, якія забяспечваюць максімальнае праяўленне іх генетычнага патэнцыялу з мінімальнымі затратамі працы, энергіі і кармоў. Выдае з 1958 зб. прац «Зоатэхнічная навука Беларусі». У 1984 на базе Бел. НДІ жывёлагадоўлі, доследна-племянной гаспадаркі «Будагова», эксперым. базы «Зарэчча» створана навук.-вытв. аб'яднанне «Племэліта». У ін-це працавалі Х.С.*Гарагляд*, В.Ц.*Горын*, У.В.*Горын*, К.М.*Сонцаў*; працуюць І.І.*Будзевіч*, В.М.*Галушка*, А.Ф.*Трафімаў*, І.П.*Шыйко*. *І.П.Шыйко.*

ЖЫВЁЛАГАДО́ЎЛЯ, галіна сельскай гаспадаркі, якая займаецца развядзеннем с.-г. жывёл для вытворчасці жывёлагадоўчых прадуктаў. Забяспечвае насельніцтва прадуктамі харчавання (малочныя прадукты, мяса, яйцы, мёд і інш.), лёгкую і харч. прам-сць сыравінай (скура, воўна, мяса, малако і інш.), дае жывую цяглавую сілу (коні, валы, аслы, мулы, вярблюды, паўн. алені і інш.), асобныя кармы (касцявая мука і інш.), лек. сродкі (гармоны, сывараткі) і арган. ўгнаенні. Грунтуецца на *заатэхніі*. Цесна звязана з *раслінаводствам*. Гал. падгалінны: *буйной рагатай жывёлы гадоўля*, *свінагадоўля*, *авечкагадоўля*, *конегадоўля*, *козагадоўля*, *аленегадоўля*, *птушкагадоўля*, *зверагадоўля*, *пчалярства*, *рыбагадоўля*, трусагадоўля, *шаўкаводства*. Развіта ў большасці краін свету. Таварная мясная і малочная Ж., птушкагадоўля на прамысл. аснове развіты ў краінах Зах. Еўропы і Паўн. Амерыкі, мясная Ж. — у краінах Лацінскай Амерыкі, свінагадоўля — у Кітаі, авечкагадоўля — у Аўстраліі і Новай Зелан-

Жывая агароджа ў Гомельскім парку імя Луначарскага.

Табліца 1

Пагалоўе жывёлы ў Беларусі (на пачатак года, тыс. галоў)

Усе катэгорыі гаспадарак	1941	1970	1991	1995	1997
Буйная рагатая жывёла,	5077	6975	5404	4855	2844
у т.л. каровы	1956	2522	2362	2181	2043
Свінні	2520	3651	5051	4004	3715
Авечкі і козы	2578	670	445	284	214
Коні	1170	333	217	220	232
Птушкі, млн. галоў	—	24,3	50,6	45,3	40,8

Табліца 2

Вытворчасць асноўных прадуктаў жывёлагадоўлі ў Беларусі

Усе катэгорыі гаспадарак	1940	1970	1990	1995	1996
Мяса (у забойнай вазе), тыс. т,	275	710	1181	657	623
у т.л. свініны	134	335	438	263	273
Малака, тыс. т	2005	5296	7457	5070	4908
Яец, млн. шт.	612	1671	3657	3373	3441
Воўна, т	3285	1213	958	396	328

ды. У свеце налічваецца (1994; млн. галоў): буйн. раг. жывёлы — 1279,5, у т.л. ў Індыі — 193, Бразіліі — 151,6, ЗША — 101,8; свіней — 873,1, у т.л. ў Кітаі — 400,7, Бразіліі — 151,6, ЗША — 56,8; авечак — 1103, у т.л. ў Аўстраліі — 132, Кітаі — 112,4, Новай Зеландыі — 51. Вытв-сць асн. прадуктаў Ж. складае (1994; млн. т): мяса — 193,8 (гал. вытворцы Кітай, ЗША, Бразілія), малака — 460,1 (гал. вытворцы ЗША, Расія, Індыя), яец — 39 (гал. вытворцы Кітай, ЗША, Японія), воўны — 2,7 (гал. вытворцы Аўстралія, Новая Зеландыя, Кітай). Ж. развіта ва ўсіх краінах, якія ўтварыліся на тэр. б. СССР, асабліва ў Прыбалтыцы, на Украіне, у Расіі. Аднак пагалоўе жывёлы і аб'ёмы вытв-сці прадукцыі Ж. ў гэтых краінах у 1990-я г. набылі тэндэнцыю да скарачэння. У Беларусі мяса-малочная Ж. займае вядучае месца сярод галін сельскай гаспадаркі. Найб. актыўна яна развівалася ў 1960—80-я г. (гл. табл. 1). У сувязі са скарачэннем пагалоўя ў 1990-я г. знізілася і валавая вытв-сць усіх відаў прадукцыі Ж. (гл. табл. 2). Скарацілася вытв-сць і спажыванне прадукцыі Ж. ў разліку на душу насельніцтва. У 1990 было атрымана мясной прадукцыі на 1 чалавека 75 кг, а ў 1996 — 60,5 кг. У структуры мясной прадукцыі, атрыманай на Беларусі, ялавічына складае 44,4%, свініна — 43,8, птушынае мяса — 10,2, бараніна — 0,6, іншыя віды — 1%. Асноўная ч. атрыманага мяса, малака і яец прыпадае на грамадскі сектар, адпаведна 72, 59 і 60% (1996). Больш развіта Ж. на З рэспублікі — у Гродзенскай, Брэсцкай і на З Мінскай абласцей, якія лепш забяспечаны кармамі, прац. рэсурсамі і матэрыяльна-тэхн. сродкамі. *Н.В.Жураўская.*

ЖЫВЁЛАГАДО́ЎЧАЯ ФЕ́РМА, сельскагаспадарчае прадпрыемства або яго падраздзяленне, прызначанае для гадоўлі (у т.л. племянной) статкаў с.-г. жывёл і вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Адрозніваюць фермы па гадоўлі буйн. раг. жывёлы, свінагадоўчыя, конегадоўчыя, птушкагадоўчыя і інш. Падзяляюцца на племянныя (узнаўленне племяннога маладняку) і таварныя (вытворчасць ялавічыны, свініны, малака, воўны і інш.). Уключаюць асн. памяшканні для ўтрымання жывёлы і дапаможныя — для захоўвання і апрацоўкі кармоў, прадукцыі і гною, для персаналу, інвентару і інш.

ЖЫВЁЛАГАДО́ЎЧЫ КО́МПЛЕКС, буйное спецыялізаванае прадпрыемства індустр. тыпу па вытв-сці прадуктаў жывёлагадоўлі на базе прамысл. тэхналогіі. Ствараецца для вытв-сці канчатковага або прамежкавага прадукту (напр., для атрымання маладняку, яго вырошчвання і адкорму ці толькі для адкорму або вырошчвання маладняку). Будуюць Ж.к. па адзіных тыпавых праектах. У эканамічна развітых краінах з 1950-х г. ствараюць буйныя Ж.к. з паточнай вытв-сцю жывёлагадоўчай прадукцыі. У ЗША Ж.к. найб. інтэнсіўна спецыялізуюцца па вытв-сці ялавічыны. На Беларусі Ж.к. пачалі актыўна будаваць у пач. 1970-х г. На пач. 1997 тут працавала больш за 150 Ж.к. па вырошчванні і адкорме буйн. раг. жывёлы, з іх 114 разлічаны на 3—10 тыс. галоў кожны, 116 свінагадоўчых Ж.к., у т.л. 53 на 12 тыс. і 35 на 24 тыс. галоў кожны; астатнія разлічаны на вырошчванне і адкорм 27, 40, 54 і 108 тыс. галоў. Найбуйнейшыя Ж.к. па вырошчванні і адкорме буйн. раг. жывёлы — с.-г. сумеснае калектыўнае прадпрыемства «Астрамечава» Брэсцкага р-на (7446 галоў), па вырошчванні і адкорме свіней — саўгас-камбінат «Барысаўскі» Барысаўскага р-на (78 477 галоў). Ж.к. эканамічна выгадныя пры дастатковым забеспячэнні іх кармамі, механізацыі ўсіх вытв. працэсаў, наяўнасці кваліфікаваных кадраў. Ва ўмовах жа Беларусі нават у сярэднім па памерах Ж.к. часта не хапае кармоў са сваіх гаспадарак. У сувязі са спыненнем пастаўкі фуражнага зерня з рэспублік б. СССР становішча на Ж.к. ускладнілася, пагалоўе жывёлы пачало скарачацца. На 1.1.1997 Ж.к. па вырошчванні і адкорме буйн. раг. жывёлы запоўнены на 45% месцаў, па вырошчванні і адкорме свіней — на 70%. Больш эфектыўна Ж.к. дзейнічаюць у Брэсцкай, Гродзенскай і на З Мінскай абласцей, дзе лепшая забяспечанасць іх кармамі і прац. рэсурсамі. У буйных і звышбуйных Ж.к. існуе праблема утылізацыі гноевай жыжкі, бо адбываецца забруджванне мясц. рэк і прылеглых тэрыторый. *Н.І.Жураўская.*

ЖЫВЁЛЫ, арганізмы, якія складаюць адно з царстваў арган. свету. Існуюць 2 узроўні арганізацыі Ж.: аднаклетачныя (прасцейшыя) і шматклетачныя. У сусв. фауне налічваецца 1,5—2 млн. відаў Ж.; у фауне Беларусі больш за 430 відаў пазваночных і да 20 тыс. відаў беспазваночных. Насяляюць сушу, паветра, воднае і глебавае асяроддзе, многія — паразіты. Адрозніваюцца ад інш. *эўкарыётаў* адсутнасцю (за невял. выключэннем) цэлюлозных клетачных абалонак. Ж. — гетэратрофы (жывяцца гатовымі арган. рэчывамі, неарган. злучэнні непасрэдна не асімілююць), размнажаюцца дзяленнем, пачкаваннем, яйцамі, жыванараджэннем і інш., здольныя да актыўнага перамяшчэння.

Некалькі дзесяткаў відаў Ж. прыручаны чалавекам або разводзяцца ў няволі; шэраг Ж. належаць да паляўніча-прамысловых (собаль, пясец, ліс і інш.). Многія Ж. выкарыстоўваюцца як лабараторныя (марскія свінкі, трусы і інш.). Пастаўшчыком бялку жывёльнага паходжання служаць с.-г. Ж. У выніку ўздзеяння чалавека на жывую прыроду, пагаршэння экалагічных умоў, знішчэння дзікіх Ж. узнікла пагроза для існавання многіх відаў (у сярэднім у свеце штодзённа знікае 1 від або падвід). На Беларусі ахова Ж. рэгулюецца адпаведнымі законамі (гл. *Ахова жывёл*) і палажэннямі зямельнага, воднага і ляснога заканадаўстваў, міжнар. пагадненнямі і інш.; рэдкія і знікаючыя віды занесены ў Чырв. кнігу.

ЖЫВЁЛЫ ШКО́ДНЫЯ, жывёльныя арганізмы рознага паходжання, узроўню арганізацыі, сістэматычнай прыналежнасці і экалагічных умоў месцапражывання, якія прама або ўскосна, часова або пастаянна, перыядычна або неперыядычна шкодзяць гаспадарцы, здароўю чалавека, свойскім і дзікім жывёлам і раслінам. Вылучаюць Ж.ш. у залежнасці ад аб'ектаў, якім яны шкодзяць: госп. (шкоднікі сельскай, рыбнай, паляўнічай гаспадаркі і інш.), ландшафтным (шкоднікі поля, саду, агарода, лесу і інш.), групам і відам раслін і жывёл (шкоднікі с.-г. раслін, хвойных і лісцевых парод дрэў і інш.). Назва «Ж.ш.» даволі ўмоўная, для канчатковай ацэнкі пэўнага віду жывёл у кожным выпадку неабходны дакладны эколага-эканам. аналіз. Аднак біягеацэнатычнае значэнне віду вызначыць цяжка. Абсалютных Ж.ш. у прыродзе няма. На

Беларусі да Ж.ш. належаць некат. віды млекакормячых (палёўкі звычайная і рыжая, дамавая мыш, чорны пацук і інш.), птушак (мышалоў балотны, шэрая варона, ястраб-цецяроўнік, вербэй дамавы і інш.), рыб (напр., джгір), малюскаў (напр., дрэйсена) і інш.; найбольшую шкоду гаспадарцы прычыняюць Ж.ш. з класа насякомых (напр., шаўкапрады, пільшчыкі, пядзенікі, караеды, пухаеды, сляпні, каларадскі жук, шведская муха, бураковая блыха, гарохавы зерняед і інш.). Для барацьбы з Ж.ш. выкарыстоўваюцца гасп. (напр., агратэхн. прыёмы рэгуляцыі колькасці), біял. (натуральныя ворагі), механічныя (непасрэднае знішчэнне пасткамі і інш.), фізічныя (знішчэнне з дапамогай высокіх або нізкіх тэмператур, ультрагуку і інш.), хім. (ядахімікаты), генетычныя (масавы выпуск лятальных мутацый, якія парушаюць нармальны цыкл размнажэння Ж.ш.) метады.

ЖЫВЁЛЬНЫ КРУХМА́Л, гл. *Глікаген.*

ЖЫВЁЛЬНЫ Э́ПАС, гл. ў арт. *Казкі пра жывёл.*

ЖЫВЁЛЬНЫЯ КАРМЫ́, прадукты жывёльнага паходжання і адходы іх перапрацоўкі, якія выкарыстоўваюцца на корм с.-г. жывёлам. Найб. пашыраныя Ж.к.: малако і прадукты яго перапрацоўкі (*адгон*, сыроватка, маслёнка і інш.), адходы мясакамбінатаў (мука мясная, мяса-касцявая, крывяная, субпрадукты і інш.), рыбакамбінатаў (мука рыбная і інш.), птушкафабрык і інкубатарных станцый (мука з гідралізатаў пер'я, тумакі, заморкі), зверабойнага промыслу (мяса цюленяў і інш. жывёл і мука з іх туш), а таксама мясцовыя Ж.к. (кукалкі тутавага шаўкапрада, малюскі, азёрныя рачкі і інш.). Ж.к. маюць шмат біялагічна паўнацэннага пратэіну, багатыя вітамінамі, макра- і мікраэлементамі.

ЖЫВЁЛЬНЫЯ РЭСУ́РСЫ, разнастайнасць жывёльнага свету акрэсленай тэрыторыі або Зямлі ў цэлым, якая складае рэальныя ці патэнцыяльныя крыніцы забеспячэння матэрыяльных, гасп. і іншых патрэб чалавека і грамадства; від *прыродных рэсурсаў*. Ж.р. — практычна гэта частка рэсурсаў *кансументаў*, якія непасрэдна выкарыстоўваюцца ў паляўнічай, рыбнай і інш. відах гаспадаркі, што грунтуюцца на промысле. Часам падзяляюць на рэсурсы карысных і рэсурсы *жывёл шкодных*. Маюць вял. практычнае і экалагічнае значэнне. Важнейшыя віды Ж.р. павінны ахоўвацца ад выдаткавання і выкарыстоўвацца рацыянальна.

ЖЫВІ́ЦА, тарпатына, тэрпенцін, смала, якая вылучаецца пры падсочцы або пашкоджанні дрэў іглічных парод (хвоя, кедр, елка, піхта, лістоўніца).

Ж. светлая, празрыстая вязкая вадкасць. Не растворваецца ў вадзе, растворваецца ў эфіры, абс. спірце, ацэтоне. Мае 35—38% *шкіпінару* і 62—65% *смаляных кіслот*. На паветры загусае, змяняе колер да цёмна-бурага і крышталізуецца ў выніку акіслення і выпарэння шкіпінару (прамысл. Ж. мае 16—20% шкіпінару). Здабываюць рэгулярнай падсочкай хвоі (выхад Ж. ў сярэднім 1—1,1 кг/год). Выкарыстоўваюць як сыравіну для атрымання шкіпінару і каніфолі. На Беларусі хваёвую Ж. перапрацоўвае Барысаўскае акц. т-ва «Лесахімік». *Я.Г.Міляшкевіч.*

ЖЫВІ́ЦА (сапр. Попка) Юрый (7.10.1912, Пружаншчына — 29.4.1990), бел. грамадскі дзеяч, пісьменнік, журналіст. У 1930 уступіў у Бел. сялянскую партыю. У час Вял. Айч. вайны ўзначальваў аддзел працы і сац. забеспячэння ў акупацыйнай цывільнай адміністрацыі Пружан (1941—42). З 1942 у Германіі. У пасляваенны час член і старшыня шэрагу бел. арг-цый, рэдактар газ. «Беларуская праўда» (1946). Выдаваў час. «Напагатове» (1948), распаўсюджваў бюлетэнь «Весткі з Беларусі». Выдаў шмат кніг па гісторыі, этнаграфіі і культуры Беларусі, у т.л. працы У.Ігнатоўскага, А.Цвікевіча. У 1982 заснаваў у г. Ляймен *Беларускі музей*, пры ім *Інстытут беларусаведы* (дырэктар у 1982—90), час. «Весткі Інстытута беларусаведы» (1986). Аўтар шматлікіх зборнікаў апавяданняў і аповесцей.

Тв.: Сьвеціць у тумане. Ляймен, 1962; Носьбіт ідэі. Ляймен, 1964. *А.С.Ляднёва.*

ЖЫВО́Е РЭ́ЧЫВА, 1) сукупнасць жывых арганізмаў *біясферы*, колькасна выражаная ў элементарным хім. саставе, масе і энергіі. Тэрмін увёў рус. вучоны У.І.Вярнадскі (1926). Ж.р. звязана з біясферай матэрыяльна і энергетычна праз біягенную міграцыю атамаў у выніку дыхання, харчавання, росту і размнажэння арганізмаў. Прадстаўлена Ж.р. *аўтатрофамі*, *гетэратрофамі*, *міксатрофамі*. Выконвае ў біясферы вял. работу і з'яўляецца магутнай геал. сілай планетарнага характару, што вызначае выгляд Зямлі. Удзельнічае ў стварэнні арганагенных асадкавых парод (каменны вугаль, бітумы, вапняк, нафта і інш.), названых Вярнадскім біягенным рэчывам біясферы. Пры ўздзеянні Ж.р. ўтвараюцца і *біякосныя рэчывы*: амаль уся вада біясферы, глеба, кара выветрывання і інш. Мае спецыфічны хім. састаў (пераважаюць вадарод, вуглярод, азот, кісларод, натрый, магній, алюміній, крэмній, фосфар) і вял. сухую масу — $2,4—3,6\times10^{12}$ т. Геахім. функцыі вызначаюць газавы састаў атмасферы (N_2, O_2, CO_2). 2) Тэрмін, прапанаваны сав. біёлагам В.Б.Лепяшынскай (1950-я г.) для вызначэння пазаклетачнай субстанцыі (не выкарыстоўваецца).

ЖЫВЫ́ АВЁС, тое, што *аўсюк*.

ЖЫ́ГА (англ. jig), 1) старадаўні нар. танец кельцкага паходжання. Спачатку парны танец (у маракоў пашыраны як сольны танец жартоўнага характару). У 17—18 ст. папулярны салонны танец у краінах Зах. Еўропы. Пазней бытаваў пераважна ў народзе. Муз. памер $^6/_8$, $^9/_8$, $^{12}/_8$. Тэмп хуткі. 2) З 17 ст. муз. п'есы розных тыпаў (у асн. 3-, 6-, 9-, 12-дольныя); заключная частка *сюіты*. Муз. форма «Ж.» выкарыстана ў балеце «Шчаўкунок» П.Чайкоўскага; у сюітах многіх бел. кампазітараў.

ЖЫГА́ЛКА асенняя, звычайная Ж. (Stomoxys calcitrans), насякомае сям. сапраўдных мух атр. двухкрылых. Пашырана ўсюды. Трапляецца ў непасрэднай блізкасці ад свойскіх жывёл (у памяшканні, на пашы). Дарослыя — крывасмокі, пераносчыкі ўзбуджальнікаў многіх інфекцый: сібірскай язвы, тулярэміі, анаплазмозу буйн. раг. жывёлы і інш.

Жыгалка асенняя.

Цела даўж. 5,5—7 мм, шэра-чорнае, плямістае. Хабаток доўгі і цвёрды. Плоднасць 300—400 яец. Адкладвае яйцы ў гной, на раслінныя рэшткі, зрэдку ў раны жывёл і чалавека, дзе развіваюцца лічынкі. Колькасць Ж. павялічваецца ў канцы лета — пач. восені (мухі становяцца «лютымі»).

ЖЫГА́НАЎ Назіб Гаязавіч (15.1.1911, г. Уральск, Казахстан — 1.6.1988), татарскі кампазітар, педагог. Нар. арт. СССР (1957). Герой Сац. Працы (1981). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1938). З 1945 рэктар і выкладчык (з 1953 праф.) Казанскай кансерваторыі. Адыграў значную ролю ў станаўленні і развіцці тат. прафес. муз. культуры. Сярод твораў: оперы «Уцякач» (1939), «Свабода» (1940), «Залатавалосая» (1941), «Ільдар» (1942), «Цюляк» (1945), «Паэт» (1947), «Гонар» (1950), «Джаліль» (1957); балеты «Фатых» (1943), «Зюгра» (1946), «Дзве легенды» (1970); кантаты (1960, 1980); 16 сімфоній (1937—85); камерна-інстр. і фп. творы, вак. цыклы, рамансы, песні. Дзярж. прэміі СССР 1948, 1950, 1970. Дзярж. прэмія Татарстана 1958.

ЖЫГІМО́НТ I Стары (1.1.1467 — 1.4.1548), вялікі князь ВКЛ і кароль польскі [1506—48], у ВКЛ Жыгімонт II. Сын *Казіміра IV* Ягелончыка. Ад старэйшага брата, караля Чэхіі і Венгрыі Уладзіслава II, атрымаў у Сілезіі Глогаўскае (1498) і Опаўскае (1501) княствы, у 1504 прызначаны каралеўскім намеснікам Сілезіі, потым Лужыцы. Пасля смерці вял. кн. ВКЛ і караля польскага *Аляксандра* абраны на пасад ВКЛ (20.10.1506) і польск. каралём (8.12.1506). Унутр. палітыка Ж. I была накіравана на ўмацаванне дзярж. улады, аднак вайск. і фін. рэформы, спробы рэдукцыі (вяртання) каронных маёнткаў, захопленых магнатамі, не мелі вял. поспеху. У 1537 супраць Ж. I і магнатаў сярэдняя шляхта Польшчы ўзняла

феад. мяцеж (т. зв. «курыная вайна»). Шляхта ВКЛ юрыдычна дамаглася роўных правоў з магнатамі: быў уведзены адзіны кодэкс законаў для дзяржавы — *Статут Вялікага княства Літоўскага 1529*. Ж. І праводзіў актыўную знешнюю палітыку, але ў войнах з Маскоўскай дзяржавай быў страчаны Смаленск. Для адбіцця нападаў крымскіх татар на Украіне была створана памежная варта з мясц. жыхароў — *казакі*. У час перамогі Рэфармацыі ў Прусіі Ж. І згадзіўся на секулярызацыю Тэўтонскага ордэна і ўтварэнне на яго тэр. васальнага ў адносінах да Польшчы герцагства на чале са сваім пляменнікам *Альбрэхтам Брандэнбургскім*. Пры Ж. І пасля загадкавай смерці апошніх удзельных мазавецкіх князёў з Польшчай было ўз'яднана Мазавецкае княства (1526, канчаткова ў 1529). Праводзячы антыгабсбургскую палітыку, Ж. І заключыў саюзы з Францыяй (1524) і Турцыяй (1533). Актыўную ролю адыгрывала ў палітыцы другая яго жонка (з 1518) *Бона Сфорца*, якая намагалася замацаваць кароны ВКЛ і Польшчы за сваім сынам *Жыгімонтам II* Аўгустам, дзеля чаго было праведзена яго абранне намінальна другім вял. князем і каралём (1529). У час панавання Ж. І у ВКЛ і Польшчы шырока распаўсюдзілася Рэфармацыя, што садзейнічала далейшаму ўздыму гуманізму і асветы.

Літ.: Finkel L. Elekcya Zygmunta I: Sprawy dynastyi Jagiellońskiej i unii polsko-litewskiej. Kraków, 1910; Wojciechowski Z. Zygmunt Stary (1506—1548). Warszawa, 1979; Wyczański A. Zygmunt Stary. Warszawa, 1985. *А.П.Грыцкевіч.*

ЖЫГІМО́НТ II Аўгуст (1.8.1520, Кракаў — 7.7.1572), вялікі князь ВКЛ і кароль польскі [1548—72, фармальна з 1529], у ВКЛ Жыгімонт III Аўгуст. Сын *Жыгімонта I* Старога і *Боны Сфорцы*. На сейме ВКЛ у кастр. 1529 Ж. II абраны вял. князем пры жыцці бацькі (г. зн. другім вял. князем). 18.12.1529 на польск. сейме Жыгімонт I дамогся абрання сына польск. каралём (каранаваны 20.2.1530). Рэальная ўлада засталася ў руках бацькі. Для ўстанаўлення сяброўскіх адносін са «Свяшчэннай Рымскай імперыяй» Жыгімонт I у 1543 арганізаваў шлюб Ж. II з эрцгерцагіняй Лізаветай, дачкой наследніка імператарскага трона Фердынанда (памерла ў 1545). У 1544 Ж. II фактычна пачаў кіраванне ў ВКЛ, куды Жыгімонт I не прыязджаў, але захоўваў сваё вяршэнства. У 1547 Ж. II ажаніўся з *Барбарай Радзівіл*. У выніку шлюбу браты Барбары М.*Радзівіл* Руды і М.*Радзівіл* Чорны занялі кіруючае становішча ў ВКЛ, пэўны час Ж. II знаходзіўся пад іх уплывам. Супраць шлюбу былі Жыгімонт I, Бона і значная частка польск. магнатаў. Пасля смерці бацькі ў 1548 Ж. II стаў паўнапраўным вял. князем і каралём. Ён заключыў тайны трактат аб узаемнай дапамозе з каралём Чэхіі і Венгрыі Фердынандам Габсбургам. Гэты саюз прадоўжаны, калі ў 1553 Ж. II ажаніўся з эрцгерцагіняй Кацярынай, сястрой сваёй першай жонкі. У далейшым адышоў ад саюзу з Габсбургамі. Знешняя палітыка Ж. II была накіравана на захаванне мірных адносін з суседнімі краінамі. Прусія заставалася васальнай дзяржавай у дачыненні да польск. караля. Адносіны са Швецыяй палепшыліся, калі там у 1568 трон заняў Юхан III, швагер Ж. II. *Лівонская вайна 1558—83* выявіла небяспеку з боку Маскоўскай дзяржавы і падштурхнула да заключэння *Люблінскай уніі 1569*, стварэння *Рэчы Паспалітай*. Унутр. палітыка Ж. II была накіравана на ўзмацненне правоў сярэдняй шляхты. Садзейнічаў правядзенню *валочнай памеры*. Пачаў буд-ва ваенна-марскога флоту Польшчы і стварыў Марскую камісію. У час кіравання Ж. II у ВКЛ і Польшчы пашырылася Рэфармацыя ў розных яе галінах. Праводзіў палітыку талерантнасці ў адносінах да ўсіх канфесій. *Прывілеем 1563* ураўнаваў паліт. правы правасл. шляхты ВКЛ з каталіцкай. Зацвердзіў *Статут Вялікага княства Літоўскага 1566*. Пад націскам кіраўніцтва каталіцкай царквы згадзіўся на допуск езуітаў у Польшчу (1564) і ВКЛ (1569), што стала пачаткам контррэфармацыі ў гэтых краінах. Быў мецэнатам, на праўленне Ж. II прыпадае росквіт культуры эпохі Адраджэння ў ВКЛ. На Ж. II скончылася мужчынская лінія дынастыі *Ягелонаў*.

Жыгімонт I Стары.

Жыгімонт II Аўгуст.

Жыгімонт III Ваза.

Літ.: Kolankowski L. Zygmunt August, wielki książę Litwy, do roku 1548. Lwów, 1913; Cynarski S. Zygmunt August. Wrocław etc., 1988; Sucheni-Grabowska A. Zygmunt August, król polski i wielki książę litewski (1520—1562). Warszawa, 1996. *А.П.Грыцкевіч.*

ЖЫГІМО́НТ III Ваза (20.6.1566, Грыпсхальм, Швецыя — 30.4.1632), вялікі князь ВКЛ і кароль польскі [1587—1632], у ВКЛ Жыгімонт IV; кароль Швецыі [1592—99]. Сын караля Швецыі Юхана (Яна) III Вазы і Кацярыны Ягелонкі, дачкі *Жыгімонта I* Старога. Абраны на трон Польшчы і ВКЛ пасля смерці *Стафана Баторыя*. Каб замацаваць свае пазіцыі сярод бел.-літ. магнатаў і шляхты, Ж. III выдаў 28.1.1588 у Кракаве прывілей, які зацвярджаў *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588*. Пасля смерці бацькі ў 1592 заняў шведскі трон. Палітыка Ж. III па аднаўленні пазіцый каталіцкай царквы ў Швецыі правалілася, у 1599 пратэстанты скінулі яго з трона. Да канца жыцця рабіў намаганні вярнуць швед. карону, пачаў *вайну Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600—29*. Падтрымаў *Брэсцкую унію 1596*, але быў вымушаны паспрыяць прыняццю пастаноў сеймаў Рэчы Паспалітай 1609, 1618 і 1631, якія гарантавалі правы праваслаўным. Прапаноўваў планы далучэння Маскоўскай дзяржавы да Рэчы Паспалітай як члена федэрацыі разам з Польшчай і ВКЛ. Падтрымаў *Ілжэдзмітрыя I*, *Ілжэдзмітрыя II*. Пасля запрашэння царом Васілём Шуйскім швед. корпуса для барацьбы з войскамі Лжэдзмітрыя II Ж. III пачаў *вайну Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18*. У выніку разгрому рас. арміі каля Клушына (1610) Васіль Шуйскі быў скінуты з трона, маскоўскія баяры і гараджане абвясцілі царом сына Ж. III — каралевіча Уладзіслава Жыгімонтавіча (гл. *Уладзіслаў IV* Ваза). Да *Дэулінскага перамір'я 1618* Ж. III дапамагаў сыну як «маскоўскаму цару». Намаганні Ж. III увесці ў Рэчы Паспалітай абсалютную манархію, спадчыннасць трона (а не выбары караля), зменшыць ролю палаты дэпутатаў (пасольскай ізбы), выклікалі ў 1606 рокаш (легальны мяцеж шляхты), які ўзначаліў гетман надворны каронны М.Зебжыдоўскі. У ліп. 1607 каля Гузава ракашане пацярпелі паражэнне. Рокаш скончыўся кампрамісам. Сейм абвясціў амністыю, зацвердзіў шляхецкія вольнасці, непарушнасць права выбару караля, пастаянную прысутнасць сенатараў для кантролю за яго дзеяннямі. Ж. III праводзіў актыўную палітыку ў паўд. напрамку. З-за свайго ультракаталіцызму падтрымліваў імператара «Свяшчэннай Рымскай імперыі» ў яго барацьбе супраць Чэхіі і Трансільваніі, што выклікала пастаянныя напады на Украіну і паўд. Польшчу крымскіх татар і туркаў, саюзнікаў Трансільваніі. У 1620 польск. войска было разбіта туркамі каля Цацоры. Рэванш, атрыманы ім у 1621 пад Хацінам, не быў выкарыстаны з-за нерашучасці Ж. III. Шмат у чым палітыка Ж. III прывяла да далейшага заняпаду дзяржавы і змяншэння яе ролі ў еўрап. паліт. жыцці 17 ст.

Літ.: Podhorodecki L. Wazowie w Polsce. Warszawa, 1985; Wisner H. Zygmunt III Waza. Wrocław etc., 1991. *А.П.Грыцкевіч.*

ЖЫГІМО́НТ КЕ́ЙСТУТАВІЧ (каля 1365 — 20.3.1440), вялікі князь ВКЛ [1432—40]. Малодшы сын *Кейстута*, брат *Вітаўта*. У час барацьбы за ўладу

паміж Вітаўтам і вял. кн. *Ягайлам* апошнім быў зняволены (1382—84). Удзельнік *бітвы на Ворскле 1399*, перагаворaў і заключэння мірных дагавораў з Тэўтонскім ордэнам 1398, 1411, 1422 і 1431, уніі Польшчы з ВКЛ, пачынаючы з 1401, *Грунвальдскай бітвы 1410*. Пасля смерці Вітаўта і абрання на трон ВКЛ *Свідрыгайлы* ў 1432 удзельнічаў у змове супраць вял. князя. Пасля ўцёкаў Свідрыгайлы ў Полацк Ж. К. абвешчаны вял. князем ВКЛ. Яго ўладу прызналі Літва, Жамойць, Падляшша, Берасцейска-Драгічынская і Менская землі, прынёманскія воласці. Астатнія бел., укр. і рускія землі падтрымалі Свідрыгайлу, які замацаваўся ў Віцебску (гл. *Свідрыгайлы паўстанне 1432—39*). Каб залучыць на свой бок бел. і ўкр. феадалаў, Ж. К. выдаў *прывілей 1434*, пачаў вылучаць на дзярж. пасады літ. і бел. баяр, што выклікала незадавальненне буйных феадалаў і князёў. У апошнія гады панавання Ж. К. пачаў аддаляцца ад Польшчы і страціў яе падтрымку. Забіты ў Трокскім замку ў выніку змовы феадалаў. *А.П.Грыцкевіч.*

ЖЫГМАНДЗІ (Zsigmondy) Рыхард Адольф, гл. *Зігмандзі* Рыхард Адольф.

Жыгулі.

ЖЫГУЛІ́, Жэгулі, горы на правым беразе р. Волга, у яе лукавіне (Самарская Лука), ч. *Прыволжскага ўзвышша*, у Самарскай вобл. Расіі. Даўж. каля 75 км, выш. да 375 м. Складзены пераважна з вапнякоў і даламітаў. Глыбокія яры і лагчыны. Вяршыні — Лысая гара, уцёс Шалудзяк, Бахілава гара, Вярблюд і інш. вельмі маляўнічыя. На паўн. схілах шыракалістыя і хваёвыя лясы, на паўд. — лесастэпы. У раёне Ж. Волжская (Куйбышаўская) ГЭС. Жыгулёўскі запаведнік. Прыродны нац. парк Самарская Лука. Турызм.

ЖЫГУЛІ́, вёска ў Шайцераўскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 5 км на ПдУ ад Верхнядзвінска, 170 км ад Віцебска, 8 км ад чыг. ст. Бароўка. 245 ж., 93 двары (1997). Клуб, б-ка, аддз. сувязі.

«ЖЫГУЛІ́», марка легкавых аўтамабіляў Волжскага аўтамаб. з-да (г. Тальяці, Расія). Гл. ў арт. *ВАЗ*.

ЖЫГУ́ЛІН Анатоль Уладзіміравіч (н. 1.1.1930, г. Варонеж, Расія), рускі пісьменнік. Скончыў Варонежскі лесатэхн. ін-т (1960). Друкуецца з 1949. У 1949—54 рэпрэсіраваны. Тэмы чалавечай стойкасці, лагерных выпрабаванняў у зб-ках «Рэйкі» (1963), «Памяць» (1964), «Палярныя кветкі» (1966), «Лятучыя дні» (1989). У аўтабіягр. аповесці «Чорныя камяні» (1988) — спроба моладзі супрацьстаяць ідэалогіі сталінскага рэжыму. Філас. роздумам, лірыкай напоўнены паэт. зб-кі «Салавецкая чайка» (1979), «Жыццё, неспадзяваная радасць» (1980), «У надзеі вечнай» (1983) і інш.

Тв.: Из разных лет, из разных далей. М., 1986; Стихотворения. М., 1987; Черные камни. М., 1990.

Літ.: Лапщиков А.П. Анатолий Жигулин: «Уроки гнева и любви...» М., 1980.

ЖЫГУЛЯ́НКА, Жыгулянскі канал, рака ў Івацэвіцкім і Бярозаўскім р-нах Брэсцкай вобл., левы прыток р. Ясельда (бас. р. Прыпяць). Даўж. 44 км. Пл. вадазбору 595 км^2. Пачынаецца за 4 км на ПдЗ ад в. Заполле Івацэвіцкага р-на, цячэ ў межах паўн.-зах. ч. Прыпяцкага Палесся па забалочанай і лясістай мясцовасці, працякае праз Чорнае воз. (пасля выхаду з яго называецца Дарагабуж). Даліна і пойма невыразныя. Рэчышча на працягу 26 км да ўпадзення ў возера каналізаванае.

ЖЫГУНЕ́Ц, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Павойнік*.

ЖЫГУНО́Ў Алесь (Аляксандр Міхайлавіч; н. 27.11.1954, в. Тройца Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1976). Настаўнічае. Друкуецца з 1969. Асн. тэмы паэзіі: родная зямля, вобразы вяскоўцаў, іх побыт, узаемаадносіны, перажыванні лірычнага героя, аналіз гераічнага мінулага Радзімы (зб-кі «Матчына вышыванка», 1984, «Мая Тройца», 1993).

ЖЫГУНО́Ў Уладзімір Раманавіч (н. 9.4.1920, в. Шамаўшчына Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Адэскую ваен. авіяц. школу пілотаў (1942), Ваен.-паветр. акадэмію (1955). У Чырв. Арміі з 1941. У Вял. Айч. вайну камандзір звяна штурмавога авіяпалка Ж. з 1943 на Сыняным, 2-м і 1-м Укр. франтах, зрабіў 194 баявыя вылеты. Удзельнік Курскай бітвы 1943, Яска-Кішынёўскай аперацыі 1944, вызвалення Польшчы, Румыніі, Чэхіі, Славакіі, баёў на тэр. Германіі. Вызначыўся ў час ліквідацыі бродскай варожай групоўкі і пашырэння Сандамірскага плацдарма (Польшча). Да 1960 у Сав. Арміі.

ЖЫГУ́ЧЫЯ, кнідарыі (Cnidaria), тып кішачнаполасцевых. 4 кл.: *гідроідныя*, *сцыфоідныя*, *каралавыя паліпы* і выкапнёвыя кануляты (Conulata). Каля 9 тыс. сучасных і 20 тыс. вымерлых відаў. Пашыраны ва ўсіх морах. Ёсць прэснаводныя віды (*гідры*), у т.л. на Беларусі.

Адзінкавыя або каланіяльныя арганізмы. 2 жыццёвыя формы: прымацоўваюцца да субстрату (паліпы) або плаваюць (медузы). Цела з 2 слаёў — эктадэрмы і энтадэрмы. Памiж імі студзяністападобная мезаглея. У эктадэрме ёсць *жыгучыя клеткі*. Большасць раздзельнаполыя. Размнажэнне палавое і бясполае. Кормяцца беспазваночнымі.

ЖЫГУ́ЧЫЯ КЛЕ́ТКІ, крапіўныя клеткі, нематацысты, кнідацысты, клеткі ў покрыўным эпітэлії і ў энтадэрме большасці *кішачнаполасцевых*, якія выконваюць функцыі нападзення на здабычу, яе ўтрымання і абароны ад ворагаў. Складаюцца з танкасценнай капсулы (нематацысты, кнідацысты), у поласці якой знаходзіцца спіральна закручаная ніць з пераважна ядавітай вадкасцю. На вонкавай паверхні клеткі ёсць нерухомы адчувальны валасок — кнідацыль, дакрананне да якога выклікае раздражненне Ж.к. і выкідванне жыгучай ніці. Укол ніці паралізуе і выклікае гібель дробнай, зрэдку болевы ацёк буйной жывёлы. Пасля выкідвання ніці Ж.к. гінуць.

ЖЫГЯ́НКА, рака, гл. *Альшанка*.

ЖЫД (Gide) Андрэ (22.10.1869, Парыж — 19.2.1951), французскі пісьменнік. Дэбютаваў паэт. «Сшыткамі Андрэ Вальтэра» (1891) і «Вершамі Андрэ Вальтэра» (1892), напісанымі пад уплывам сімвалізму. Апошні стаў вызначальным у аповесцях «Падарожжа Урыяна» і «Вопыт кахання» (абедзве 1893) і асабліва ў тэарэт. «Трактаце пра Нарцыса» (1891). Сталыя проза і драматургія Ж. адметныя вострай крытыкай маральных асноў і інстытутаў бурж. грамадства, асабліва сям'і і царквы, распрацоўкай новых сюжэтных прыёмаў, уплывам паэтыкі саці — сярэдневяковага фарса: кніга лірычнай прозы «Ежа зямная» (1897), сатыр. аповесць «Кепска прыкаваны Праметэй» (1899) і аповесць «Імараліст» (1902). Вядомасць яму прынеслі раман «Цесная брама» (1909) і аповесць «Ізабель» (1911), у якіх распрацоўваецца тэма барацьбы асобы за права на самавыражэнне. Аўтар рамана «Падзямелле Ватыкана» (1914) і аповесці «Пастаральная сімфонія» (1919), аб'яднаных рэзкай антыклерыкальнай накіраванасцю, рамана «Фальшываманетчыкі» (1926). Стылістычнай дасканаласцю вылучаецца яго драматургія («Цар Кандаўл», 1901, «Саул», 1903, «Эдып», 1931), «Дзённікі» (т. 1—3, 1939—50), эсеістыка. Нобелеўская прэмія 1947.

Тв.: Рус. пер. — Фальшивомонетчики; Тесные врата. М., 1991; Избр. произв. М., 1993; Избранное. М., 1997. *К.М.Міхееў.*

ЖЫД (Gide) Шарль (29.6.1847, г. Юзес, Францыя — 13.3.1932), французскі эканаміст, гісторык, тэарэтык франц. каап. руху, стваральнік т.зв. Німскай школы. Скончыў Парыжскі ун-т (1874). Праф. ун-таў у Бардо (1874), Манпелье (1880), Парыжы (1898—1920). Прыхільнік суб'ектыўнай школы палітэканоміі і тэорыі «кааператыўнага сацыялізму». Лічыў, што капіталіст. вытв-сць можа

быць рэфармавана шляхам масавага развіцця спажывецкіх кааператываў, якія забяспечаць справядлівыя адносіны паміж вытворцамі і спажыўцамі. У 1887—1911 выдаваў час. «Revue d'Économie Politique» («Агляд палітэканоміі»). Аўтар прац «Прынцыпы палітэканоміі» (1884), «Гісторыя эканамічных вучэнняў ад фізіякратаў да навейшых часоў» (разам з Ш.Рыстам, 1909) і інш.

ЖЫ́ДЛІЦКІ (Židlicky) Вацлаў (н. 16.4.1931, в. Купічаў Валынскай вобл., Украіна), чэшскі літаратуразнавец і перакладчык. Д-р філалогіі (1967). Ганаровы д-р БДУ (1996). Скончыў Карлаў ун-т у Празе (1955), з 1976 праф. гэтага ун-та. Даследуе гісторыю бел. і ўкр. л-р, іх сувязі з чэш. л-рай. Аўтар прац «Украінская і беларуская літаратура ў чэшскіх перакладах» (1956), «Малы слоўнік савецкіх пісьменнікаў. Ч. 2. Украінскія і беларускія пісьменнікі» (1959, 2-е выд. 1966), «Даследаванні па гісторыі чэшска-беларускай супольнасці» (1960), «Кароткі нарыс гісторыі беларускай літаратуры» (1972); сааўтар «Слоўніка пісьменнікаў. Савецкі Саюз» (т. 1—2, 1978, арт. пра бел. і ўкр. пісьменнікаў), «Нарысаў па гісторыі літаратур народаў СССР» (1982, з Р.Паралекам) і інш. На чэш. мову пераклаў кнігі А.Адамовіча, В.Быкава, Я.Брыля, У.Караткевіча, А.Карпюка, У.Калесніка, І.Пташнікава, І.Шамякіна, асобныя творы Ц.Гартнага, К.Чорнага і інш. Укладальнік «Анталогіі сучаснай беларускай паэзіі», аднатомнікаў Я.Купалы, М.Танка і інш.

Літ.: Гардзіцкі А. Размова з Вацлавам Жыдліцкім // Далягляды. Мн., 1980.

А.В.Мальдзіс.

ЖЫДО́ВІЧ Марыя Андрэеўна (19.10.1906, в. Дукора Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 12.11.1977), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1958), праф. (1959). Засл. дз. нав. Беларусі (1971). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1938). Працавала ў Ін-це мовазнаўства АН Беларусі (1946—59), БДУ (1943—46, 1959—77). Даследавала гісторыю бел. мовы і бел. гаворак. Аўтар працы «Назоўнік у беларускай мове» (ч. 1, 1969), адзін з аўтараў кніг «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія», «Нарысы па гісторыі беларускай мовы» (абедзве 1957), бібліягр. паказальніка «Беларускае мовазнаўства (1825—1965)» (1967), рэдактар «Матэрыялаў для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак» (вып. 1—3, 1970—77). *Н.С.Мажэйка.*

«ЖЫДО́ЎСТВУЮЧЫХ» ЕРАСЬ, нацыянальна-маскоўская ерась, рэлігійнае вучэнне апошняй трэці 15 — пач. 16 ст. ў Ноўгарадзе (потым і Маскве), прыхільнікі якога былі абвінавачаны правасл. духавенствам у далучэнні да *іудаізму* (адсюль назва). Узнікла ва ўмовах барацьбы ВКЛ і Вял. княства Маскоўскага за ўплыў на Ноўгарад у апошні перыяд яго самастойнасці. У 1470—71 намеснікам вял. князя ВКЛ у Ноўгарадзе быў М.А.Алелькавіч (гл. ў арт. *Алелькавічы*), у свіце якога былі вучоныя яўрэі: лейб-медык Схарыя, Майсей Хануш і Іосіф Шмойла Скарабей. Прынесеныя імі ідэі ахапілі частку мясц. духавенства і гараджан прамаскоўскай арыентацыі (пратапопы Дзяніс і Аляксей, пратапоп Сафійскага сабора Гаўрыіл). Створаная секта мела тайны характар. У 1479 вял. кн. маскоўскі Іван III перавёў у Маскву ў прыдворныя цэрквы Дзяніса і Аляксея, якія распаўсюдзілі ерась сярод баярства і пры двары. Сярод ерэтыкоў былі дзяк Пасольскага прыказа Ф.Курыцын, нявестка Івана III Алена, баяры І.Патрыкееў, С.Рапалоўскі і інш. «Жыдоўствуючыя» крытыкавалі царк. іерархію, падвяргалі сумненню боскасць Хрыста, траістасць Бога, існаванне замагільнага жыцця, адмаўлялі ўсе прадметы рэліг. культу, ін-т манастваа і інш. Ерась была выкрыта ў 1487 і асуджана царк. саборамі 1488, 1490, 1503 і 1504. Наўгародскі архіепіскап Генадзь і настаяцель Валакаламскага манастыра Іосіф Валоцкі абвінавацілі ерэтыкоў у схіленні ў іудаізм (што аспрэчваецца шэрагам гісторыкаў) і дамагліся ад Івана III санкцыянавання ў 1504 смяротных прысудаў іх кіраўнікам. Пасля гэтага ерась заняпала, некат. «жыдоўствуючыя» ўцяклі ў ВКЛ. Крыніцамі вывучэння «Ж.» е. з'яўляюцца пасланні Генадзя, праца Іосіфа Валоцкага «Асветнік», матэрыялы царк. сабора 1490, літ. помнікі саміх «жыдоўствуючых» (пераклады кніг Старога Запавету на царк.-слав. мову рус. рэдакцыі з дамешкам беларусізмаў).

С.В.Марозава.

ЖЫ́ДЧА, вёска ў Хойнаўскім с/с Пінскага р-на Брэсцкай вобл., каля вадасх. *Жыдча*. Цэнтр саўгаса. За 22 км ад горада і чыг. ст. Пінск, 200 км ад Брэста. 706 ж., 232 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі.

ЖЫ́ДЧА, вадасховішча ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., за 22 км на ПдЗ ад г. Пінск, каля в. Жыдча. Створана ў 1980 на месцы выпрацаванага радовішча торфу. Пл. 1,2 км^2, даўж. 1,3 км, найб. шыр. 1,1 км, найб. глыб. 9 м, аб'ём вады 5,1 млн. м^3. Наліўное. Напаўняецца вадой з р. Прыпяць пры дапамозе водападводнага канала. Ваганні ўзроўню на працягу года да 6 м. Выкарыстоўваецца для арашэння, рыбаводства і рэкрэацыйных мэт.

ЖЫ́ЖАЛЬ, у беларускай народнай міфалогіі бог агню, апякун рамёстваў, найперш кавальскага. Яго ўяўлялі магутным дэманам, які пад зямлёй у вогненнай кузні куе зброю, каб скінуць *Перуна*. Ж. паважалі за мужнасць і непакорнасць, але баяліся яго. Былі ўпэўнены, што, калі ён доўга працаваў у кузні, перагравалася зямля і пачыналася засуха, гарэлі тарфяныя балоты і лясы. Калі Ж. выходзіў з-пад зямлі, Пярун у гневе кідаў у Ж. вогненныя стрэлы-маланкі. Не папаўшы ў Ж., маланка магла быць прычынай пажару.

ЖЫ́ЖКА (Žižka) Ян (каля 1360, Троцнаў, Чэхія — 11.10.1424), чэшскі нац. герой, палкаводзец перыяду *гусіцкіх войнаў*. З дробнай шляхты. У 1406—09 удзельнічаў у паўстанцкай вайне супраць паноў у Паўд. Чэхіі. З 1409 на службе ў польск. караля *Ягайлы*; прымаў удзел у *Грунвальдскай бітве 1410*. У 1414 пры двары *Вацлава IV*. Адзін з кіраўнікоў паўстання жыхароў Новага Месца ў Празе 30.7.1419. Першыя перамогі атрымаў у пач. 1420 каля Некамір-

А.Жыд.

Я.Жыжка. З карціны мастака Р.Бема.

жа і Судамержа. Вызначыўся 14.7.1420 пры абароне Віткавай гары каля Прагі. Са снеж. 1420 першы гетман *табарытаў*. На Чаславскім сейме 1.6.1421 выбраны ў ліку 20 правіцеляў Чэшскай зямлі. Выразнік інтарэсаў дробнай шляхты і мяшчан-гусітаў, падтрымліваў «Чатыры пражскія артыкулы». У ліп. 1421 пры аблозе замка Рабі Ж. страціў зрок. У час 3-га крыжовага паходу супраць гусіцкай Чэхіі ў 1422 разбіў нямецкае войска каля Кутна-Горы і Нямецкі-Броду. У пач. 1423 парваў з радыкальнымі табарытамі і заснаваў ва Усх. Чэхіі Малы Табар. 7.6.1424 разбіў войска пражан і паноў каля Малешава. Памёр ад чумы ў час аблогі г. Пршыбіслаў.

Літ.: Ревзин Г.И. Ян Жижка. [М.], 1952; Мацек Й. Табор в гуситском революционном движении: Пер. с чеш. Т. 2. М., 1959; Озолин А.И. Бюргерская оппозиция в гуситском движении: Соц.-полит. требования. Саратов, 1973. *Дз.М.Чаркасаў.*

ЖЫ́ЖМА, рака на тэр. Літвы і Беларусі, правы прыток р. Гаўя (бас. р. Нёман). Даўж. 82 км. Пл. вадазбору 584 км^2. Пачынаецца ў Шальчынінкскім р-не Літвы, цячэ ў Воранаўскім, Лідскім і Іўеўскім р-нах Гродзенскай вобл. Даліна трапецападобная. Пойма двухбаковая, забалочаная, шыр. да 800 м. Рэчышча на працягу 27,4 км ад в. Мікянцы Воранаўскага р-на каналізаванае, шыр. ад 5 да 15 м. Берагі пясчана-глеістыя, стромкія, часам абрывістыя.

ЖЫЖЭ́НКА Уладзімір Аляксандравіч (н. 23.1.1931, г. Дарагабуж, Расія), бел. перакладчык. Скончыў БДУ (1953). Настаўнічаў. З 1953 у Дзярж. выд-ве БССР, з 1964 на Бел. радыё, у 1969—94 у час. «Нёман». Друкуецца з 1953. Пераклаў на рус. мову раманы М.Лобана «Гарадок Устронь» (1972), Л.Арабей «Іскры ў папялішчы» (1973), А.Васілевіч «Пачакай, затрымайся...» (1975), Б.Са-

чанкі «Вялікі Лес» (1986), В.Адамчыка «Голас крыві брата твайго» (1990), І.Чыгрынава «Вяртанне да віны» (1993), аповесць М.Гарэцкага «Дзве душы» (1991) і інш.

ЖЫЛА ў геалогіі, пласцінападобнае геал. цела, якое ўтварылася ў выніку запаўнення трэшчыны мінер. рэчывам або з прычыны метасаматычнага замяшчэння ім горнай пароды ўздоўж трэшчыны. Адрозніваюць простыя рудныя Ж. — адзінокія трэшчыны, і складаныя — пучкі трэшчын зон драблення ці рассланцавання. Даўж. ад некалькіх метраў да 200 км. З Ж. звязаны многія радовішчы розных відаў мінер. сыравіны (золата, свінцова-цынкавыя руды, вальфрам, ртуць і інш.).

ЖЫЛЕ́ (Gillet) Нікала Франсуа (2.3.1709, г. Мец, Францыя — 7.2.1791), французскі скульптар. Вучыўся ў Каралеўскай акадэміі жывапісу і скульптуры ў Парыжы (да 1745), у Франц. акадэміі ў Рыме (1746—52). Выкладаў ў Пецярб. АМ (1758—77), значна паўплываў на развіццё рас. скульптуры; сярод вучняў Ф.І.*Шубін*, М.І.*Казлоўскі*, Ф.Ф.*Шчадрын*, І.П.*Пракоф'еў* і інш. Удзельнічаў у аздабленні Зімняга палаца ў Пецярбургу (1758—77). У 1778 вярнуўся ў Парыж. Працаваў у станковай і арнаментальна-дэкар. скульптуры, дзе спалучаў рысы ракако з асобнымі элементамі класіцызму («Парыс з яблыкамі», 1757, партрэт вял. кн. Паўла Пятровіча, 1765, і інш.).

ЖЫЛІБЕ́Р (Gilibert) Жан Эмануэль (21.6.1741, г. Ліён, Францыя — 2.9.1814), французскі і бел. натураліст, хірург і анатам. Д-р медыцыны (1763). Скончыў ун-т у г. Манпелье і працаваў у Ліёнскім калежы (1763—74). У 1775—81 арганізаваў і кіраваў *Гродзенскай медыцынскай акадэміяй*. Заснавальнік акушэрскай і вет. школ у Гродне, клінічнага шпіталя (1775—81), бат. сада. У 1781—83 праф. натуральнай гісторыі мед. ф-та Гал. школы ВКЛ (пазней Віленскі ун-т), дзе заснаваў бат. сад. З 1783 у Францыі. Навук. працы па флоры Беларусі, Літвы, Польшчы, па эпідэміялогіі эндэмічных хвароб у гэтых краінах.

ЖЫ́ЛІН Павел Андрэевіч (18.3.1913, с. Вараб'ёўка Варонежскай вобл., Расія — 6.2.1987), расійскі ваенны . гісторык. Чл.-кар. АН СССР (1968), ген.-лейт. (1968). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1946). У Вял. Айч. вайну ўдзельнічаў у бітве пад Масквой, вызваленні Беларусі. З 1958 нам. гал. рэдактара «*Военно-исторического журнала*», з 1964 прарэктар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС, з 1966 нач. Ін-та ваен. гісторыі Мін-ва абароны СССР. Асн. працы: «Гібель напалеонаўскай арміі ў Расіі» (1968), «Фельдмаршал М.І.Кутузаў» (3-е выд., 1987), «Айчынная вайна 1812 г.» (3-е выд., 1988) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1952, Ленінская прэмія 1982.

ЖЫ́ЛІН Яўген Ільіч (н. 20.3.1939, г. Гомель), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1971), выкладаў там у 1972—75. Працуе ў станковай і кніжнай графіцы, жывапісе. Творчасці ўласцівы настальгічная рамантычнасць, багацце колеравай гамы (цыклы «Настальгія», «Мужчына і жанчына», карціны «Сон каралевы», «Красавіцкія мары», усе 1994). Аўтар акварэлей «Лета на Віліі» (1977), «Палескія краявіды» (1980), «Півоні» (1994), «Кветкі ў трох збанах» (1995), літаграфій «Лета» і «Цішыня» (абедзве 1972), «Восеньскі пейзаж» і «Успаміны пра лета» (абедзве 1981), «Поле» (1982), жывапісных твораў «Адыходзячыя ў аблокі» (1993), трыпціха «Дзецям Чарнобыля прысвячаецца» (1993—94), «Выкраданне Еўропы» (1994) і інш. Праілюстраваў каля 70 кніг, многія з якіх адзначаны дыпломамі («Дарункі лесу» К.Цвіркі, 1969, «Такіх кветак не бывае» В.Гарбука, 1971, «Дзівы» І.Васілеўскага, 1972, і інш.).

Я.**Жылін**. Амазонка. З цыкла «Настальгія». 1994.

ЖЫ́ЛІНА (Žilina), горад на ПнЗ Славакіі, на р. Ваг. Каля 100 тыс. ж. (1995). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: маш.-буд., тэкст., швейная, цэлюлозна-папяровая, хімічная. Музей транспарту. У 15 ст. адзін з цэнтраў гусіцкага руху. Касцёлы: раманскі св. Стэфана (13 ст.), раманска-гатычны (15—16 ст.). Турыстцкі цэнтр сярэднягорнага раёна Малой Фатры.

ЖЫЛІНСКА́ЙТЭ (Žilinskaitė) Вітаўтэ (н. 13.12.1930, г. Каўнас, Літва), літоўская пісьменніца. Засл. дз. культ. Літвы (1980). Скончыла Вільнюскі ун-т (1955). У кнігах апавяданняў, фельетонаў, літ. пародый «Не з першага погляду» (1962), «Анёл над горадам» (1967), «Парадоксы» (1973), «Карціна» (1981), «Дурман» (1984) і інш. высмейвае заганнасць маральна-быт. і грамадскіх з'яў жыцця, адзначае складанасць і супярэчлівасць праблем сучаснай цывілізацыі. Сатырыка-гумарыстычным творам уласцівы неверагодныя кантрасты, гіпербалы, парадоксы, іронія. За дакумент. аповесць «Мая нянавісць мацнейшая» (1964) і лепшыя творы сатыры і гумару Дзярж. прэмія Літвы 1972. Аўтар казак і п'ес для дзяцей, пабудаваных на фантастыцы і ўмоўнасцях (кн. «Робат і матылёк», 1978, Дзярж. прэмія Літвы 1979, «Ледзяная фея», 1979, «Падарожжа ў Тандадрыку», 1984, і інш.). На бел. мову асобныя творы Ж. пераклалі М.Базарэвіч, У.Казбярук.

ЖЫЛІ́НСКІ Іосіф Іпалітавіч (20.4.1834, Віленская губ. — 1916), расійскі і бел. геадэзіст. Скончыў Пецярб. ін-т інжынераў шляхоў зносін (1854). У 1863—73 кіраваў градусным вымярэннем дугі паралелі 52° паўн. ш. (на Беларусі прыкладна па лініі Брэст—Пінск—Мазыр—Гомель). У 1881—93 нач. трыянгуляцыі зах. тэр. Расіі. У 1873—98 узначальваў *Заходнюю экспедыцыю па асушэнні балот* Палесся, пазней — забалочаных зямель Маскоўскай, Разанскай, Уладзімірскай губ. Удзельнічаў у астр.-геад. работах за мяжой.

Тв.: Очерк работ Западной экспедиции по осушению болот (1873—1898). СПб., 1899.

ЖЫЛІ́НСКІС (Žilinskis) Арвідс (31.3.1905, в. Саука Екабпілскага р-на, Латвія — 31.10.1993), латышскі кампазітар, піяніст, педагог. Нар. арт. Латвіі (1965), нар. арт. СССР (1983). Праф. (1967). Скончыў Латвійскую кансерваторыю па класах фп. (1927) і кампазіцыі (1933, клас Я.*Вітала*). З 1927 педагог Рыжскай нар. кансерваторыі, з 1937 — Латв. дзярж. кансерваторыі (з 1992 Латв. муз. акадэмія). Заснавальнік лат. аперэты: «У краі блакітных азёр» (1954), «Шэсць маленькіх барабаншчыкаў» (1955), «Хлопцы з бурштынавага берага» (1964), «Тайна чырвонага мармуру» (1969), «Толькі ружы» (1977). Сярод інш. твораў: оперы «Залаты конь» (1965), «Ветрык, вей!» (1970), «Мая і Пая» (1980); дзіцячыя балеты «Спрыды-

тыс» (1968), «Чыпаліна» і «Чароўная птушка Лаліты» (1979), «Кошчын млын» (1986); кантаты; канцэрты з арк., у т.л. для фп. (1948, 1983), для валторны (1985); больш за 800 хар. і сольных песень; музыка да драм. спектакляў і інш. Дзярж. прэмія Латвіі 1967.

ЖЫ́ЛІС-ГА́РА (Žylis-Gára) Тэрэса (н. 23.1.1930, Вільня), польская спявачка (сапрана). Вучылася ў Вышэйшай муз. школе ў Лодзі (1952—57). З 1957 у Оперным т-ры ў Кракаве. З 1960 у ФРГ: салістка оперных т-раў у гарадах Обергаўзен, Дортмунд, Дзюсельдорф. Выступае ў буйнейшых т-рах свету. Валодае моцным рухомым голасам прыгожага тэмбру, вял. муз. культурай, акцёрскім майстэрствам. Адна з лепшых сучасных выканальніц партый у операх В.А.Моцарта. Сярод інш. партый: Дэздэмона, Леанора, Віялета («Атэла», «Трубадур», «Травіята» Дж.Вердзі), Чыо-Чыо-сан, Тоска (аднайм. оперы Дж.Пучыні), Манон («Манон» Ж.Маснэ), Ліза («Пікавая дама» П.Чайкоўскага). Мае вял. камерны рэпертуар.

ЖЫ́ЛІХАВА, вёска ў Бучацінскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 32 км на Пд ад Капыля, 149 км ад Мінска, 13 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 590 ж., 240 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ЖЫ́ЛІЦКІ ПАЛА́ЦАВА-ПА́РКАВЫ АНСА́МБЛЬ, помнік палацава-паркавай архітэктуры 18—19 ст. Створаны ў в. Жылічы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. У ансамбль уваходзяць палац, парк, 3 штучныя вадаёмы (рыбная гаспадарка). Палац пабудаваны ў 1830-я г. (арх. К.Падчашынскі) у стылі класіцызму. Спачатку ўзведзены гал. П-падобны 2-павярховы корпус, аздоблены порцікамі карынфскага ордэра: 6-калонным у цэнтры і 4-калоннымі на бакавых фасадах. Цэнтр. ч. вылучана бельведэрам над лесвічнай клеткай. Да паўн.-зах. тарца гал. корпуса пазней прыбудавана доўгае 2-павярховае крыло з палацавай царквой, якое замыкалася 2-павярховым корпусам з праезнай брамай. Фасады насычаны класіцыстычным арх. дэкорам. Інтэр'еры былі аздоблены пазалочанай лепкай, размалёўкай, дэкар. тканінамі і карцінамі (знішчаны ў 2-ю сусв. вайну). У будынку размешчаны саўгас-тэхнікум. Плошча парку 18 га (разам з пладовымі садамі і рыбнай гаспадаркай каля 100 га). У плане — выцягнуты прамавугольнік, абмежаваны алеямі. Тэр. парку з Пн на Пд перасякае р. Дабасна, якая ўтварае 3 маляўнічыя вадаёмы з астраўкамі (засталіся рэшткі масткоў і альтанак). Перад паўн. корпусам палаца ўцалелі фрагменты рэгулярнага парку пач. 18 ст. — круглая пляцоўка і 2 кляновыя алеі. У 1830-я г. створаны пейзажны парк, кампазіцыя якога падпарадкавана палацаваму ансамблю. Перад усх. порцікам размешчаны партэр у выглядзе эліпса. У парку дэкар. формы дрэў (дуб звычайны пірамідальны, клён вастралісты Швэдлера) і экзоты (хвоя веймутава, клён серабрысты і інш.).

У.А.Чантурыя, В.Р.Анціпаў.

ЖЫ́ЛІЦКІ САЎГА́С-ТЭ́ХНІКУМ. Засн. ў 1948 у в. Жылічы (Кіраўскі р-н). Спецыяльнасць (1997/98 навуч. г.): аграномія; плодаагародніцтва; вытв-сць, захоўванне і перапрацоўка прадукцыі раслінаводства. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Паводле бесперапыннай інтэграванай сістэмы прафес. адукацыі прымаюцца таксама выпускнікі прафес.-тэхн. навуч. устаноў. Навучанне дзённае і завочнае.

ЖЫ́ЛКА Уладзімір Адамавіч (27.5.1900, в. Макашы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. — 1.3.1933), бел. паэт. Вучыўся ў Пражскім ун-це (1923—26). Як рэдактар час. «Новы прамень» (Прага) запрошаны ў 1926 у Мінск для ўдзелу ў навук., канферэнцыі па рэформе правапісу; застаўся тут. Працаваў у газ. «Звязда» і муз. тэхнікуме. У 1930 беспадстаўна арыштаваны, высланы ў г. Уржум (Кіраўская вобл.). Там і памёр. Рэабілітаваны ў 1960. Друкаваўся з 1920 у мінскіх выданнях, з 1921 у зах.-бел. прэсе, з 1923 у часопісах бел. студэнцтва ў Чэхаславакіі, пражскім зб. «Славянская книга». Паэт рамант. складу. Аўтар лірычнай паэмы «Уяўленне» (Вільня, 1923), зб-каў вершаў «На ростані» (Вільня, 1924), «З палёў Заходняй Беларусі» (Мн., 1927). Творча пераносіў традыцыі еўрап. рамантызму на глебу зах.-бел. л-ры. У вершах «Віхор», «Меч», «Хто смелы» і інш. у сімвалічных вобразах паэтызаваў ахвярнае служэнне Радзіме, свабодзе. Выяўляў ідэю паяднання чалавека з сацыяліст. явай, сцвярджаў харство новых узаемаадносін асобы і грамадства («Млынар паставіў застаўкі», «Раніцою», паэма «Тэстамент»). Творчасці Ж. ўласцівы інтэлектуальная, гуманіст. і эстэт. культура, высокае паэт. майстэрства. Пераклаў на бел. мову асобныя творы М.Лермантава, А.Міцкевіча, Г.Ібсена, Ш.Бадлера, І.Волькера, Б.Ясенскага.

Тв.: Вершы. Мн., 1970; Пожні. Мн., 1986; Творы. Мн., 1996; Творы. Мн., 1998.

Літ.: Калеснік У. Ветразі Адысея: Уладзімір Жылка і рамантычная традыцыя ў бел. паэзіі. Мн., 1977; Яго ж. Усё чалавечае. Мн., 1993. *У.А.Калеснік.*

ЖЫЛКАВА́ННЕ, 1) сістэма размяшчэння праводзячых сасудзіста-валакністых пучкоў (жылак) у лісцевых пласцінках і інш. органах вышэйшых раслін (акрамя імхоў); важная сістэматычная прыкмета. Бывае паралельнае (злакі, асокі), дыхатамічнае (гінкга, некат. папараці), дугавое (ландыш, купена, трыпутнік), сеткаватае (клён, яблыня, шалфей). Дугавое і паралельнае Ж. ўласціва аднадольным раслінам, сеткаватае (або перыстае) — пераважна двухдольным раслінам. Жылкі ёсць таксама ў чашалісціку, пялёстках, пладах і сцёблах раслін. 2) Ж. ў насякомых — відаспецыфічнае; размяшчэнне жылак на крылах. Жылкі ўяўляюць сабой полыя трубчастыя патаўшчэнні пласцінкі крыла, у якіх размешчаны адгалінаванні трахейных ствалоў і нерваў; утвараюць каркас крыла.



Ж.Э.Жылібер.

У.А.Жылка.

Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль. Палац. Від з двара.

ЖЫ́ЛКІН Барыс Дзмітрыевіч (15.3.1895, Гастынскае лясніцтва, Варшаўская губ., Польшча — 5.3.1979), бел. вучоны ў галіне лесаводства. Д-р с.-г. н. (1966), праф. (1931). Засл. лесавод Беларусі (1965). Скончыў Петраградскі лясны ін-т (1917). У 1946—79 у Бел. тэхнал. ін-це. Навук. працы па біялогіі, дэндралогіі, экалогіі і тыпалогіі

лесу, біял. меліярацыі, водаахоўнай ролі, праблемах павышэння прадукцыйнасці лясоў.

Тв.: Повышение продуктивности сосновых насаждений культурой люпина. Мн., 1974.

ЖЫ́ЛКІН Уладзімір Барысавіч (9.9.1919, лясны кардон Белы ключ, Татарстан — 13.6.1997), бел. вучоны ў галіне металургіі. Канд. тэхн. н. (1972). Сын Б.Дз.*Жылкіна*. Скончыў Артыл. акадэмію ў Самаркандзе (1943), Горны ін-т (1949, Ленінград). У 1973—91 у НДІ парашковай металургіі (Мінск). Навук. працы па гідраэлектраметалічнай вытв-сці нікелю, стварэнні новых фільтравальных элементаў. Распрацаваў сістэму ачысткі электралітаў нікелевай вытв-сці на аснове тытанавых фільтраў (у сааўт). Ленінская прэмія 1965.

ЖЫЛКО́ Уладзімір Васілевіч (н. 20.2.1925, в. Лугавая Слабада Мінскага р-на), бел. вучоны ў галіне глебазнаўства. Д-р с.-г. н. (1974). Скончыў БДУ (1951). З 1958 у Бел.НДІ глебазнаўства і аграхіміі. Навук. працы па вывучэнні эрозіі глеб Беларусі, распрацоўцы мерапрыемстваў па барацьбе з эрозіяй і павышэнні ўрадлівасці эрадзіраваных глеб, глебаахоўных тэхналогій выро-шчвання с.-г. культур, глебаахоўнай контурна-меліярацыйнай сістэмы земляробства.

Тв.: Эродированные почвы Белоруссии и их использование. Мн., 1976; Сохранение почв. Мн., 1989 (у сааўт.); Земледелие с почвоведением. Мн., 1989 (у сааўт.).

ЖЫЛЛЁ, збудаванні для жыцця і арганізацыі побыту чалавека, аховы ад неспрыяльных уздзеянняў прыродных фактараў. Тыпы Ж. вызначаюцца ўзроўнем развіцця прадукц. сіл грамадства, буд. тэхнікі, характарам сац. адносін, геагр. асяроддзя і традыцый арганізацыі сямейнага ладу; разнавіднасці, маст. і кампазіцыйныя асаблівасці, абсталяванне і ўпрыгожанне інтэр'еру — эстэт. густам чалавека.

Найб. простыя тыпы Ж. вядомы з часоў каменнага веку (пячоры, зямлянкі, паўзямлянкі, буданы, пабудовы на палях і інш.). Краінам з цёплым кліматам характэрны тып Ж. з групоўкай замкнёных звонку памяшканняў вакол унутр. адкрытых дворыкаў (мегароны Стараж. Грэцыі, атрыумна-перыстыльныя дамы Стараж. Рыма); у краінах з умераным і халодным кліматам будавалі прамавугольныя ў плане дамы з асвятленнем праз вокны ў сценах. З паяўленнем гарадоў вылучыліся тыпы гар. і сельскіх пабудоў. У гарадах побач з індывід. 1—2-павярховымі дамамі будавалі шматпавярховыя на некалькі сем'яў (інсулы Стараж. Рыма). Для сярэдневякоўя характэрны замкі і палацы — Ж. феадалаў. Складваліся тыпы сялянскага Ж., якое захавала свае характэрныя рысы на многія стагоддзі; у гарадах сфарміраваўся тып дома, дзе спалучаліся жылыя, гандл. і складскія памяшканні, майстэрні рамеснікаў. У буд-ве такіх дамоў выкарыстоўвалі драўляныя канструкцыі (на аснове каркаса ці зруба), а таксама цагляныя, каменныя і мяшаныя (тэхніка «прускага муру»). Высокім маст. узроўнем вызначалася архітэктура рэнесансу (гл. *Адраджэнне*), *барока*, *класіцызму*. Рост гарадоў і гар. насельніцтва ў 19 ст. прывялі да разбурэння структуры старых феад. гарадоў і, як вынік, да змены традыц. тыпаў Ж. Гар. Ж. 20 ст. развіваецца ў рэчышчы асн. арх. стыляў (*мадэрн*, *канструктывізм*, *функцыяналізм* і інш.; гл. таксама *Урбанізм* і *Дэзурбанізм*).



Рэшткі **жылля** старажытнага Бярэсця. 12—13 ст.

На Беларусі з прымітыўных відаў Ж. (ямы, пячоры, буданы) развіліся яго найб. стараж. формы, што адносяцца да эпохі палеаліту. Пабудовы мелі канструкцыйную аснову з касцей маманта (паселішча *Бердыж* Чачэрскага р-на). Для неаліту і бронз. веку характэрны паглыбленыя ў зямлю жылыя збудаванні з шатровымі дахамі (каля воз. Ліцін Калінкавіцкага, в. Лучын Рагачоўскага р-наў). Вядомы таксама збудаванні на палях і памостах (в. Асавец Бешанковіцкага р-на). У жал. веку будавалі паўзямлянкі слупавой канструкцыі (в. Малышкі Вілейскага р-на), якія з 5—8 ст. паступова змяніліся невял. наземнымі дамамі слупавой і зрубнай канструкцый, разлічанымі на адну сям'ю (в. Гарадзішча Мядзельскага, в. Тайманава Быхаўскага р-наў). Такое аднакамернае Ж. забяспечвала патрэбы сям'і і стала асновай для развіцця ўсіх тыпаў жылых сельскіх і гар. дамоў на Беларусі. У сярэдневякоўі вядомы зрубныя 1-, 2-, 3-камерныя дамы, якія разам з гасп. будынкамі складалі сядзібу. Архітэктура Ж., яго планіроўка і маст. асаблівасці вызначаліся заможнасцю гаспадара і арх.-буд. традыцыямі асобных гіст.-этнагр. рэгіёнаў (Паазер'е, Падняпроўе, Панямонне і інш.). Гар. Ж. 9—13 ст. у асноўным складалася з невял. адназрубных пабудоў, якія ставілі вельмі шчыльна (Брэст, Віцебск, Мінск, Полацк і інш.). Ж. феадалаў 14—16 ст. мела элементы абарончых збудаванняў (замкі, дамы-крэпасці). У 16—18 ст. гар. і местачковае Ж. характарызавалася ўскладненнем планіроўкі, пашырэннем мураванага буд-ва, буд-ва ў тэхніцы «прускага муру» і змешаных канструкцый. Дамы гандляроў і рамеснікаў ствараліся аснову забудовы цэнтр. вуліц і плошчы (рынку), часам мелі на гал. фасадзе галерэю на слупах — падчэні (Іўе, Мір). У 18 ст. атрымаў пашырэнне гар. дом з мураваным гал. фасадам і драўлянай

Да арт. **Жыллё**. Дом рамесніка ў г. Нясвіж Мінскай вобл. 1721.

Да арт. **Жыллё**. Дом канца 19 — пач. 20 ст. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.

Да арт. **Жыллё**. Жылы дом у г.п. Ветка Гомельскай вобл. 1950-я г.

часткай у глыбіні двара (Нясвіж, Гродна, Паставы). З 17 ст. пашырылася буд-ва палацава-паркавых комплексаў. Асн. элементам іх стаў палац ці сядзібны дом з элементамі ордэрнай сістэмы, а таксама ў стылі *рамантызму*. З 2-й пал. 19 ст. ў сувязі з распрацоўкай планаў забудовы гарадоў структура гар. Ж. змянілася. Павялічылася буд-ва шматкватэрных жылых дамоў. У 1920-я г. буд-ва і рэканструкцыя Ж. пачалі ажыццяўляцца на планавай аснове. З'явіліся рабочыя пасёлкі (імя Камінтэрна ў Мінску і інш.). У канцы 1920 — пач. 1930-х г. сталі будаваць шматпавярховыя шматкватэрныя дамы. Сац. ўмовы садзейнічалі з'яўленню новых тыпаў Ж.: інтэрнаты, дзіцячыя дамы, дамы-камуны, якія ўключалі і прадпрыемствы камунальна-быт. абслугоўвання. У Вял. Айч. вайну на Беларусі знішчана каля 400 тыс. жылых будынкаў, што патрабавала значных намаганняў для аднаўлення жылога фонду. З сярэдзіны 1950-х г. пашырылася буд-ва Ж. індустр. метадамі, выкарыстанне вял. арх. элементаў (панэльныя і аб'ёмныя блокі і інш.), што дало магчымасць паскорыць тэмпы ўзвядзення будынкаў. Значныя аб'ёмы жыл. буд-ва садзейнічалі прагрэсіўным метадам планіроўкі і забудовы раёнаў. Сучасныя жылыя дамы маюць адпаведнае быт. і інж. забеспячэнне, адпавядаюць нормам сан. гігіены. Сталі пашыранымі малапавярховыя (1—2 паверхі), сярэдняй паверхавасці (3—5), шматпавярховыя (6—10), павышанай паверхавасці (11—16) і вышынныя (больш за 16 паверхаў), адна- ці шматсекцыйныя, калідорныя, галерэйныя, змешанай планіроўкі будынкі. Больш сталі будаваць дамоў катэджавага тыпу і аднаго з відаў часовага Ж. — садовых домікаў. Асн. тыпам сял. Ж. заставаліся зрубныя хаты пач. і сярэдзіны 20 ст. (гл. *Драўлянае дойлідства*). Сучасныя вясковыя жылыя дамы па планіровачнай арганізацыі і ўзроўні інж. абсталявання набліжаюцца да гарадскіх, у іх аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі і маст. вырашэнні адчуваецца імкненне да захавання традыц. вырашэнняў.

Літ.: Воинов А.А. Жилищное строительство в Белорусской ССР. Мн., 1980; Трацевский В.В. История архитектуры народного жилища Белоруссии. Мн., 1989; Сергачев С.А. Белорусское народное зодчество. Мн., 1992; Лакотка А.І. Пад стрэхамі прашчураў. Мн., 1995. *С.А.Сергачоў.*

ЖЫЛЛЁВА-БУДАЎНІ́ЧЫ КААПЕРАТЫ́Ў, добраахвотнае аб'яднанне грамадзян з мэтай буд-ва жылых памяшканняў на ўласныя сродкі або з дапамогай крэдытаў, субсідый і інш. форм дзярж. падтрымкі. Кааператыў як юрыд. асоба — уласнік жылых памяшканняў у будынках Ж.-б.к. Яго члены маюць права ўласнасці толькі на паенакапленні ў кааператыве адпаведна ўнесеных сродкаў і кошту іх жылых памяшканняў, а права ўласнасці на жылое памяшканне — пасля аплаты яго поўнай вартасці і юрыд. афармлення гэтага права. Дзейнасць і кіраванне Ж.-б.к. рэгулююцца статутам, які прымаецца на ўстаноўчым сходзе. Вышэйшы орган кіравання — агульны сход, які выбірае праўленне, старшыню, рэвіз. камісію. Першыя Ж.-б.к. ўзніклі ў 19 ст. ў Зах. Еўропе. У БССР пачалі стварацца з 1921. У 1937 ліквідаваны, а іх дамы перададзены ў фонд мясц. органаў улады. Для паскарэння тэмпаў буд-ва ў адпаведнасці з рашэннем урада СССР у 1958 стварэнне Ж.-б.к. адноўлена. У канцы 1980 — пач. 1990-х г. развіццё набыло новы ўзровень (могуць ствараць ца ў нарматыўна-явачным парадку, больш дэмакратычна праводзіць сваю дзейнасць і інш.). Развіццё Ж.-б.к. (пры ўмове дзярж. фін. падтрымкі) — адна з перспектыўных форм вырашэння жыллёвага пытання. Гл. таксама *Жыллёвы фонд*. *У.А.Вітушка.*

Да арт. **Жыллё**. Сядзібны дом у в. Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна Гомельскай вобл.

Да арт. **Жыллё**. Жылы дом у Мінску.

ЖЫЛЛЁВАЕ БУДАЎНІ́ЦТВА, гл. ў арт. *Будаўніцтва, Жыллёвая гаспадарка, Жыллёвы фонд*.

ЖЫЛЛЁВАЕ ПРА́ВА, сукупнасць прававых норм, якія рэгулююць адносіны па выкарыстанні *жыллёвага фонду* — набыцці, буд-ве, кіраванні, эксплуатацыі і рамонце, размеркаванні і прадастаўленні жылля для грамадзян. Ж.п. не з'яўляецца самаст. галіной права і супадае па сэнсе з паняццем «жыллёвае заканадаўства». У Рэспубліцы Беларусь гал. крыніцай Ж.п. з'яўляюцца Канстытуцыя і *жыллёвы кодэкс* Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе грамадзянам права на жыллё. Гэта права забяспечваецца развіццём дзярж. і прыватнага жыллёвага фонду, садзейнічаннем грамадзянам у набыцці жылля. У адпаведнасці з заканадаўствам грамадзянам, якія маюць патрэбу ў сац. абароне, жыллё прадастаўляецца дзяржавай ці мясц. самакіраваннем бясплатна або па даступнай для іх аплаце. Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены жылля. Пытанні Ж.п. рэгулююцца і інш. прававымі актамі, якія выдаюцца мін-вамі і ведамствамі, мясц. Саветамі і іх выканаўчымі органамі. *С.У.Скарулiс.*

ЖЫЛЛЁВА-ЭКСПЛУАТАЦЫ́ЙНАЯ СЛУ́ЖБА (ЖЭС), жыллёва-эксплуатацыйны ўчастак (ЖЭУ), пярвічнае звяно *жыллёвай гаспадаркі*, якое ажыццяўляе эксплуатацыю *жыллёвага фонду*. ЖЭС уваходзяць у склад жыллёвых рамонтна-эксплуатацыйных аб'яднанняў (ЖРЭА) або вытв. аб'яднанняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі (ВАЖКГ) раённых (гарадскіх) выканкомаў і ажыццяўляюць сваю дзейнасць на прынцыпах гасп. разліку. Эксплуатацыяй ведамаснага жыллёвага фонду займаюцца жыллёва-камунальныя канторы, якія таксама ўваходзяць у сістэму жыллёвай гаспадаркі. *А.Дз.Сідарэнка.*

ЖЫЛЛЁВАЯ ГАСПАДА́РКА, падгаліна жыллёва-камунальнай гаспадаркі; сукупнасць *жыллёвага фонду*, жыллёва-эксплуатацыйных і інш. арг-цый, якія забяспечваюць утрыманне, аднаўленне і павышэнне якасці жылых дамоў і памяшканняў, абслугоўванне грамадзян, якія ў іх пражываюць. У Рэспубліцы Беларусь сістэма жыллёва-эксплуатацыйных арг-цый уключае абласныя, раённыя і гарадскія вытв. ўпраўленні, якія аб'ядноўваюць *жыллёва-эксплуатацыйныя службы* (участкі, ЖЭС). У сістэму Ж.г. ўваходзяць таксама жыллёва-камунальныя канторы прадпрыемстваў, якія маюць на балансе жыллёвы фонд, не-

дзяржаўныя кампаніі па кіраванні жылымі дамамі і інш. арг-цыі, якія аказваюць паслугі ў сферы ўтрымання жылля. *А.Дз.Сідарэнка.*

ЖЫЛЛЁВЫ КО́ДЭКС РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, сістэматызаваны заканадаўчы акт, які рэгулюе жыллёвыя і інш. звязаныя з імі грамадскія адносіны. Прыняты Вярх. Саветам БССР 10-га склікання 22.12.1983 і ўведзены ў дзеянне 1.4.1984. У кодэксе вылучаны агульныя палажэнні, асобны раздзел прысвечаны кіраванню *жыллёвым фондам*, падрабязна рэгламентаваны парадак забеспячэння грамадзян памяшканнямі ў дамах жыллёва-буд. кааператываў, карыстання жылымі памяшканнямі ў дамах дзярж. і грамадскага жыллёвага фонду, службовымі жылымі памяшканнямі, інтэрнатамі, у дамах індывід. жыллёвага фонду. Асобныя раздзелы кодэкса рэгламентуюць пытанні забеспячэння захаванасці жыллёвага фонду, яго эксплуатацыі і рамонту, адказнасці за парушэнне жыллёвага заканадаўства, вырашэння жыллёвых спрэчак. У сувязі з тым, што многія палажэнні кодэкса ўстарэлі і патрабуюць пэўных змен, распрацоўваецца новы жыллёвы кодэкс. *С.У.Скаруліс.*

ЖЫЛЛЁВЫ ФОНД, сукупнасць жылых дамоў і памяшканняў незалежна ад форм уласнасці. Уключае жылыя дамы агульнага тыпу, спец. дамы (інтэрнаты рознага прызначэння, дамы манеўранага фонду і інш.), асобныя кватэры, службовыя і інш. жылыя памяшканні ў розных будынках, прызначаныя для пастаяннага пражывання. Адрозніваюць Ж.ф. дзярж., юрыд. асоб і індывідуальны. У дзярж. Ж.ф. уваходзяць дамы і жылыя памяшканні, што знаходзяцца ў веданні мясц. Саветаў дэпутатаў, мін-ваў, дзярж. прадпрыемстваў, устаноў, камітэтаў і ведамстваў (ведамасны Ж.ф.). Ж.ф. юрыд. асоб складаецца з жылых памяшканняў жыллёвых і *жыллёва-будаўнічых кааператываў*, маладзёжных жылых комплексаў, калектываў індывід. забудоўшчыкаў, грамадскіх арг-цый, калгасаў, камерцыйных і некамерцыйных арг-цый і інш. Індывід. Ж.ф. уключае жылыя дамы і кватэры, якія знаходзяцца ў асабістай уласнасці грамадзян. Дамы садаводчых т-ваў у Ж.ф. не ўваходзяць. Ж.ф. выконвае шэраг функцый у нар. гаспадарцы: забяспечвае сац. абарону асобных катэгорый грамадзян, садзейнічае рассяленню насельніцтва ў інтарэсах развіцця нар. гаспадаркі, з'яўляецца аб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці і інш. Ж.ф. Беларусі на 1.1.1997 налічвае 3 млн. 679,6 тыс. кватэр і індывід. жылых дамоў. Дзярж. Ж.ф. складае 201,4 млн. м^2 агульнай пл., або 30,5%, індывід. — 59,1%, юрыд. асоб — 10,4%. Гл. таксама *Жыллёвае права, Жыллёвы кодэкс Рэспублікі Беларусь.* *У.А.Вітушка.*

ЖЫЛУНО́ВІЧ Зміцер, гл. *Гартны* Цішка.

ЖЫ́ЛЬНЫЯ ГО́РНЫЯ ПАРО́ДЫ, магматычныя метасаматычныя горныя пароды, якія залягаюць у выглядзе жыл, даек і інш. дробных цел, цесна звязаных з інтрузіўнымі масівамі. Утвараюцца пры застыванні магмы ў шчылінах зямной кары. Іх склад можа адпавядаць пародам буйных інтрузій (гл. *Інтрузіўныя горныя пароды*) або значна адрознівацца ў выніку працэсаў дыферэнцыяцыі магмы і ўзаемадзеяння яе з прылеглымі горнымі пародамі. Сярод Ж.г.п. вылучаюць меланакратавыя, абагачаныя цемнаколернымі мінераламі (керсантыт, спесартыт і інш.), і лейкакратавыя, складзеныя пераважна з светлаколерных мінералаў (апліт, пегматыт, плагіяклазіт і інш.). З Ж.г.п. звязаны радовішчы золата, свінцова-цынкавых руд, вальфраму, ртуці і інш. Трапляюцца ў крышт. фундаменце Беларусі. *У.Я.Бардон.*

ЖЫЛЬСО́Н (Gilson) Поль (15.6.1865, Брусель — 3.4.1942), бельгійскі кампазітар, муз. крытык; адзін з заснавальнікаў сучаснай фламандскай кампазітарскай школы. Праф. Брусельскай (1899—1901) і Антверпенскай (1904—09) кансерваторый. У 1925 засн. час. «Revue musicale belge» («Бельгійскі музычны часопіс», існаваў да пач. 1940-х г.). У яго творчасці своеасабліва пераўтвораны традыцыі нац. муз. фальклору, дасягненні еўрап. і рус. муз. культур. Найб. вылучаецца яго аркестравая музыка — сімфонія «Мора» (1890), сімф. варыяцыі (1902) і інш. Аўтар опер «Прынцэса Сонечны Прамень» (1903), «Людзі мора» (паводле В.Гюго, 1904), балета «Нявольніца» (1904), вак.-сімф. твораў, у т.л. араторыі «Дэман» (паводле Ю.Лермантава), кантаты «Сінай» (1889) і інш., муз.-тэарэт. прац па гармоніі і аркестроўцы.

ЖЫЛЬЦО́ЎСКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1910—25 у маёнтку Жыльцы Гарадоцкага пав. (цяпер вёска ў Віцебскім р-не). Былі 4 паравыя машыны (66 к.с.). У 1913 працавала 390 рабочых. На паліва выкарыстоўваўся торф.

ЖЫЛЮ́К Міхаіл Аляксандравіч (н. 27.10.1948, с. Багданаўка Цярнопальскай вобл., Украіна), бел. спявак (лірыка-драм. барытон). Засл. арт. Беларусі (1991). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1974). З 1971 саліст Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Валодае прыгожым мяккім голасам вял. дыяпазону, высокай пеўчай культурай. Сярод партый: Рыка, Бургамістр («Джардана Бруна», «Візіт дамы» С.Картэса), Леў Данілавіч («Князь Наваградскі» А.Бандарэнкі), Раберт, Ялецкі («Іаланта», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Маралес («Кармэн» Ж.Бізэ), Шарплес («Чыо-Чыо-сан» Дж.Пучыні), Валянцін («Фауст» Ш.Гуно), Жэрмон («Травіята» Дж.Вердзі), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні; прэмія на 1-м Міжнар. конкурсе оперных спевакоў імя С.Крушальніцкай, 1991, Львоў), Раеўскі («Вайна і мір» С.Пракоф'ева), сола барытона ў вак.-харэагр. прадстаўленні «Карміна Бурана» на муз.К.Орфа. Выступае як камерны спявак. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу імя М.І.Глінкі (1981). *Т.Г.Мдывані.*

ЖЫЛЯ́НІН Якім Аляксандравіч (22.8.1903, в. Гайна Лагойскага р-на Мінскай вобл. — 30.8.1979), дзеяч КПБ, адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Віцебшчыне ў Вял. Айч. вайну. Скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1948). З 1927 на сав. і парт. рабоце, з 1939 заг. аддзела кадраў ЦК КП(б)Б, сакратар Магілёўскага абкома КП(б)Б. У 1941—44 упаўнаважаны эвакуацыйнага савета пры СНК СССР. З 1942 сакратар Віцебскага падп. абкома КП(б)Б. З 1944 сакратар Віцебскага, 1-ы сакратар Полацкага абкомаў КП(б)Б, з 1946 у ЦК КП(б)Б, у 1949—59 старшыня Магілёўскага аблвыканкома. Чл. ЦК КПБ у 1940—60. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1938—63, Вярх. Савета СССР у 1950—54.

ЖЫЛЯ́РДЗІ, Джылярдзі (Gilardi) Даменіка [Дзяменцій Іванавіч; 4.6.1785 (або 1788), Мантаньёла, каля г. Лугана, Швейцарыя — 28.2.1845], архітэктар. Прадстаўнік рускага *ампіру*. Ганаровы чл. Пецярб. АМ (з 1830). Па паходжан-

Д.Жылярдзі. Дом Луніных. Фрагмент фасада галоўнага корпуса.

ні італьянец. Вучыўся ў свайго бацькі-архітэктара, потым у Міланскай АМ (1804—06). У 1810—32 працаваў у Расіі. Пасля пажару 1812 у Маскве аднавіў будынак ун-та (1817—19), перабудаваў будынкі Екацярынінскага ін-та (цяпер Цэнтральны дом Рас. Арміі), Апякунскага савета (цяпер АМН), жылы дом С.С.Гагарына (цяпер Ін-т сусв. л-ры імя Горкага), падмаскоўную сядзібу князёў Галіцыных Кузьмінкі (усе 1820-я г.) і інш. Архітэктура будынкаў вызначаецца манументальнасцю, урачыстай параднасцю. Майстар садова-паркавага мастацтва.

Літ.: Белецкая Е.А., Покровская З.К. Д.И.Жилярди. М., 1980.

ЖЫНКО́ Сцяпан Рыгоравіч (1897, Акцябрскі р-н Гомельскай вобл. — жн. 1919), удзельнік грамадзянскай вайны. У час ням. акупацыі (1918) камандзір партыз. атрада (130 чал.). Пасля вызвалення Бабруйскага пав. ў ліст. 1918 камандзір батальёна, сфарміраванага з б. падпольшчыкаў і партызан. Удзельнічаў у падаўленні *стракапытаўскага мяцяжу 1919* у Гомелі. З 1919 на фронце. Загінуў у баі пад Бабруйскам.

ЖЫНО́ВІЧ (Жыдовіч) Іосіф Іосіфавіч (14.5.1907, в. Арэшкавічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 13.1.1974), бел. цымбаліст, дырыжор, кампазітар, педагог. Нар. арт. СССР (1968). Праф. (1963). Скончыў юрыд. ф-т БДУ (1931), Бел. кансерваторыю (1941). Выступаў як сельскі музыкант-самавук. Прафес. дзейнасць пачаў у 1922 як саліст-цымбаліст БДТ (Нац. т-р імя Я.Купалы). У 1930—35 кіраўнік, у 1938—41 саліст, канцэртмайстар і педагог, з 1946 маст. кіраўнік і гал. дырыжор *Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь* (з 1974 імя Ж.). З 1944 педагог Беларускай кансерваторыі, дзе заснаваў клас цымбалаў і кафедру нар. інструментаў (у 1946—63 яе загадчык). Як прафес. выканаўца на бел. цымбалах тонка адчуваў прыроду інструмента, выдатна выяўляў яго выразныя магчымасці. Яго ігра вызначалася віртуозным размахам, артыстызмам, беражлівым стаўленнем да аўтарскага тэксту. Сольны рэпертуар складаўся з уласных арыгінальных твораў («Беларускія танцы», «Працяжная і карагодная» і інш.), пераладжэнняў п'ес Ф.Шапэна, Г.Вяняўскага, І.Штрауса, Ф.Крэйслера. Канцэртаваў як віртуоз-цымбаліст у Германіі, Фінляндыі, Канадзе, Польшчы. Стварыў унікальны па складзе нар. аркестр, для станаўлення якога вял. значэнне меў яго ўдзел ў рэканструкцыі муз. інструментаў, найперш цымбалаў. Выключны ўклад Ж. ў стварэнне рэпертуару для гэтага калектыву, у т.л. уласных твораў («Беларуская мелодыя» для ансамбля цымбалаў і 2 арфаў, «Сказ-быліна аб зямлі беларускай», канцэртныя апрацоўкі нар. танцаў «Лявоніха» і «Мікіта», а таксама пераладжэнняў — 7-й сімфоніі В.А.Моцарта, сімфаньеты «Беларускія карцінкі» М.Чуркіна, фіналаў 1-га канцэрта для фп. з арк. і Серэнады для стр. аркестра П.Чайкоўскага, фп. п'ес «У манастыры» з «Маленькай сюіты» А.Барадзіна і «Бататырскія вароты» з «Карцінак з выстаўкі» М.Мусаргскага і інш. твораў класічнай і сучаснай музыкі). Асабліва вялікі ўклад Ж. ў падрыхтоўку выканальніцкіх і пед. кадраў — стварэнне ім першай школы ігры на бел. цымбалах. Сярод яго вучняў В.*Бурковіч*, Я.*Гладкоў*, Т.*Сцяпанава*, М.Шмелькін і інш. Лаўрэат 1-га Усесаюзнага агляду выканаўцаў на нар. інструментах (1939). Дзярж. прэмія Беларусі 1968. З 1987 на Беларусі праводзіцца Рэсп. конкурс імя Ж. У Мінску на доме, дзе жыў Ж., устаноўлена мемар. дошка.

І.І.Жыновіч.

Літ. тв.: Белорусские цимбалы // Науч.-метод. зап. Бел. гос. консерватории. Мн., 1958. Вып. 1; Государственный белорусский народный оркестр. Мн., 1958; Оркестр цимбалистов. Мн., 1968; Школа ігры на цымбалах. 3 выд. Мн., 1993.

Літ.: Насценка З.М. Іосіф Жыновіч. Мн., 1969. *А.Я.Ракава.*

ЖЫРАНДЫ́СТЫ, брысоцінцы, палітычная групоўка перыяду *Французскай рэвалюцыі 1789—99*. Вылучыліся ў 1791—92 як левая меншасць (136 дэп.) Заканад. сходу. Лідэры: шэраг дэпутатаў ад дэпартамента Жыронда (адсюль назва), у т.л. П.В.Верньё, Ж.П.*Брысо*, А.*Кандарсэ* і інш. Абапіраліся на буйную і ч. сярэдняй гандл.-прамысл. буржуазіі. Выступалі за актыўную знешнюю палітыку і поўную свабоду гандлю, супраць дваранска-раялісцкай контррэвалюцыі. Пасля прыходу да ўлады ў выніку звяржэння манархіі 10.8.1792 перайшлі на кансерватыўныя пазіцыі, складалі правае крыло Канвента, спаборнічалі з мантаньярамі (гл. *Гара*). Да кастр. 1792 многія Ж. ўваходзілі ў *Якабінскі клуб*. Страцілі ўладу ў выніку нар. паўстання ў Парыжы 31.5—2.6.1793; у кастр. 1793 частка Ж. пакарана смерцю. Пасля тэрмідарыянскага перавароту 1794 далучыліся да контррэвалюцыянераў. *У.Я.Калаткоў.*

Ф.Жырардон. Апалон і німфы. 1666—76.

ЖЫРАРДО́ (Girardot) Анні (н. 25.10.1931, Парыж), французская актрыса. Скончыла Парыжскую кансерваторыю (1954). Працавала ў т-ры «Камеды Франсэз». У кіно з 1956. Этапнай у яе творчасці стала роль Надзі ў фільме Л.Вісконці «Рока і яго браты». Вобраз моцнай і гордай жанчыны, якая самастойна вырашае свой лёс, актрыса вар'іруе ў фільмах «Тры пакоі ў Манхатане», «Памерці ад кахання», «Няма дыму без агню» (у пракаце «Шантаж»). Яе мастацтва вылучаецца незвычайнай пластычнасцю, схільнасцю да сарказму, лірычнага гумару, уменнем ярка і дакладна акрэсліць характар. Сярод інш. фільмаў: «Жанчына-малпа», «Доктар Француаза Гаян», «Знаёмства па шлюбнай аб'яве», «Пяцічотны паліцэйскі», «Ключ да дзвярэй», «Кажыце, мне цікава».

ЖЫРАРДО́Н (Girardon) Франсуа (17.3.1628, г. Труа, Францыя — 1.9.1715), французскі скульптар, прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў Труа, потым у Рыме ў Л.*Берніні* (да 1650), зазнаў уплыў барока. З 1657 чл. Каралеўскай акадэміі жывапісу і скульптуры ў Парыжы (праф. з 1659). Майстар манум.-дэкар. скульптуры. Аўтар скульпт. груп («Апалон і німфы», 1666—76, «Выкраданне Празерпіны», 1699, і інш.) і дэкар. ваз для палаца і парку ў Версалі, грабніцы кардынала Рышэлье ў царкве Сарбоны (1675—94), коннай статуі Людовіка XIV на Вандомскай пл. ў Парыжы (1683—99; разбурана ў 1792), шэрагу партрэтных бюстаў.

ЖЫРА́ФА (Giraffa camelopardalis), млекакормячае сям. жырафавых атр. парнакапытных. Пашырана ў Афрыцы на Пд ад Сахары, у адкрытых стэпах (саваннах) з рэдкімі дрэвамі і кустамі. Жыве невял. групамі па 7—15 (зрэдку болей) асобін.

Буйная жывёла, тулава кароткае, на высокіх нагах (пярэднія даўжэйшыя за заднія); шыя вельмі доўгая, але шыйных пазванкоў 7, як у большасці млекакормячых. Выш. цела да 6 м, маса да 1800 кг (самцы большыя за са-

мак). Мае 1 або 2 пары рожак, укрытых скурай з валаскамі. Афарбоўка светла-жоўтая з цёмнымі плямамі. Нараджае 1 дзіцяня. Корміцца лісцем і галінкамі дрэў, найчасцей акацый. Захавалася пераважна ў нац. парках.



Жырафы.

ЖЫРА́ФА (лац. Camelopardalis), каляполюснае сузор'е Паўн. паўшар'я неба. Найб. яркая зорка 4,0 візуальнай *зорнай велічыні*. На тэр. Беларусі відаць круглы год. Гл. *Зорнае неба*.



Сузор'е **Жырафа**.

ЖЫРКЕ́ВІЧ Міхаіл Іванавіч (13.10.1899, в. Залесавічы Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 13.8.1984), бел. мовазнавец. Канд. пед. н. (1944). Засл. дз. нав. Беларусі (1951). Скончыў БДУ (1927). Працаваў настаўнікам, выкладчыкам у Магілёўскім пед. ін-це (1933—41), БДУ (1943—69). Аўтар падручнікаў па бел. мове для сямігадовай і сярэдняй школ, артыкулаў па пытаннях сучаснай бел. літ. мовы, у т.л. пра моватворчасць Я.Купалы («Аб народнасці мовы паэмы Я.Купалы «Над ракою Арэсай», 1954, «Аб мове камедыі Я.Купалы «Паўлінка», 1958, «Аб мове паэмы Я.Купалы «Бандароўна», 1960, і інш.).

І.К.Германовіч.

ЖЫРМУ́НСКІ Аляксандр Мацвеевіч (11.6.1887, г. Бялінскі Пензенскай

А.М.**Жырмунскі**.

вобл., Расія — 9.5.1970), бел. геолаг. Чл.-кар. АН БССР (1936), д-р геолага-мінералагічных н., праф. (1944). Скончыў Маск. ун-т (1913). З 1918 дацэнт Маск. горнай акадэміі. У 1927—41 у Геал. к-це ВСНГ, Мін-ве геалогіі СССР. У 1936—38 дырэктар Ін-та геалогіі і гідрагеалогіі АН БССР, заг. кафедры геалогіі БДУ. У 1943—45 кіраўнік геал. групы, у 1946—49 навук. супрацоўнік Ін-та геал. навук АН БССР. У 1949—51 супрацоўнік НДІ у Ленінградзе. На тэр. Беларусі праводзіў даследаванні па гідрагеалогіі, чацвярцічнай геалогіі, геамарфалогіі і тэктоніцы.

Тв.: Принципы и методы составления карт четвертичных (антропозойских) отложений // Изв. АН БССР. Сер. геол. 1947. № 2; Геологические особенности тектонических структур БССР. Ч. 1—2 // Там жа. 1948. № 5—6.

ЖЫРМУ́НСКІ Віктар Максімавіч (2.8.1891, С.-Пецярбург — 31.1.1971), расійскі філолаг. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1939). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1912). З 1919 праф. Ленінградскага ун-та. Чл.-кар. Германскай (Берлін, 1956), Брытанскай (1962), Дацкай (1967), Баварскай (1970) АН. Ганаровы д-р Оксфардскага, Кракаўскага, Берлінскага і Карлава (Прага) ун-таў. Асн. працы па пытаннях герм., агульнага і цюрк. мовазнаўства, дыялекталогіі, гісторыі зах. і рус. л-ры, тэорыі л-ры, паэтыкі, вершаскладання, фальклору і ўсходазнаўства: «Нямецкі рамантызм і сучасная містыка» (1914), «В.Брусаў і спадчына Пушкіна» (1922), «Рыфма, яе гісторыя і тэорыя» (1923), «Байран і Пушкін» (1924), «Уводзіны ў метрыку. Тэорыя верша» (1925), «Гётэ ў рускай літаратуры» (1937), «Народны гераічны эпас» (1962) і інш. Аўтар фундаментальнай працы «Нямецкая дыялекталогія» (1956), адзін з аўтараў «Параўнальнай граматыкі германскіх моў» (т. 1—4, 1962—66).

Тв: Творчество Анны Ахматовой. Л., 1973; Тюркский героический эпос. Л., 1974; Теория стиха. Л., 1975; Общее и германское языкознание. Л., 1976; Теория литературы. Поэтика. Стилистика. Л., 1977; Байрон и Пушкин; Пушкин и западные литературы. Л., 1978; Сравнительное литературоведение: Восток и Запад. Л., 1979; Из истории западноевропейских литератур. Л., 1981; Гете в русской литературе. Л., 1982.

Літ.: В.М.Жирмунский. М., 1965.

І.У.Саламевіч

ЖЫРМУ́НЫ, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл., на аўтадарозе Ліда—Вільнюс (Літва). Цэнтр сельсавета і эксперым. базы «Кастрычнік». За 16 км на ПдЗ ад г.п. Воранава, 107 км ад Гродна, 8 км ад чыг. ст. Бастуны. 671 ж., 273 двары (1997).

Вядомы з пач. 15 ст. як родавы маёнтак Бутрымаў. У канцы 15 — пач. 20 ст. ўласнасць Мантоўтавічаў, Радзівілаў, Завішаў, Тышкевічаў, Шванебахаў. На карце Т.Макоўскага 1613 пазначаны як мястэчка. З 1795 у складзе Рас. імперыі. У 19 — пач. 20 ст. цэнтр воласці Лідскага пав. Віленскай губ. У пач. 20 ст. — 323 ж. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Лідскага пав. Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 12.10.1940 цэнтр сельсавета ў Радунскім р-не, з 1959 у Воранаўскім р-не. У 1971 — 587 ж., 198 двароў.

Лясніцтва. Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — касцёл (1789). Помнік сав. актывістам.

ЖЫРО́БУС, гіробус [ад грэч. gyros круг + лац. (omni)bus для ўсіх], бязрэйкавая машына, якая рухаецца за кошт кінетычнай энергіі, назапашанай у *махавіку*. Выкарыстоўваецца як дапаможны трансп. сродак для перавозкі пасажыраў (грузаў) на невял. адлегласці і абслугоўвання выбухованебяспечных аб'ектаў. Раскручваецца махавік эл. або пнеўматычным рухавіком на зарадных пунктах. Выкарыстоўваюцца таксама (з 1955) электражыробусы, аснашчаныя асінхронным рухавіком-генератарам, сучленены з махавіком, і цягавымі электрарухавікамі. Доследныя ўзоры Ж. (ЗША) абслугоўваюць пасаж. трасы да 12 км.

ЖЫРО́ВІЦКАЕ ЕВА́НГЕЛЛЕ, бел. рукапісны помнік 15 ст. Назва ад в. *Жыровічы* (Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.), дзе евангелле захоўвалася да сярэдзіны 19 ст. ва Успенскім саборы. На 376—377-м аркушах па-беларуску зроблены фундушавы надпіс канцлера ВКЛ Льва Сапегі (адсюль другая назва рукапісу — «Евангелле Сапегі»). Пісана ўставам на 404 аркушах. Багата аздоблена застаўкамі, мініяцюрамі з выявамі евангелістаў, шматлікімі ініцыяламі. Мініяцюры абведзены шырокімі залочонымі рамкамі, арнаментаванымі геам. і раслінным узорамі; у іх выкананні адчуваецца сувязь з візант. маст. традыцыяй. Малюнкі вызначаюцца пластычнасцю, выразнай індывідуалізацыяй, жанравасцю задумы і мажорнасцю каларыту (фарбы кадміева-чырвоныя, сінія, зялёныя і вохрыста-залацістыя). Зберагаецца ў Цэнтр. б-цы АН Літвы.

В.Ф.Шматаў.

ЖЫРО́ВІЦКІ АБРА́З МА́ЦІ БО́ЖАЙ, адна з гал. хрысціянскіх святынь Беларусі. Ушаноўваецца правасл. і грэка-каталіцкай цэрквамі як цудатворны. Знаходзіцца ў *Жыровіцкім Успенскім манастыры*. Абраз — авал з яшмы, на адным

баку якога рэльефная выява Маці Божай тыпу Замілаванне з дзіцем на правай руцэ. Паводле царк. падання, з'явіўся ў 1470 пастушкам у лесе на грушы-дзічцы. Гісторык П.М.*Жуковіч* лічыў больш верагоднымі датамі падзеі 1493—95. З пач. 17 ст. абраз стаў славіцца за цудоўныя вылячэнні. Пакланіцца яму прыязджалі людзі розных саслоўяў, у т.л. каралі Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV, Ян Казімір, Ян III Сабескі, Аўгуст II, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. У 1730 на абраз ускладзены прывезеныя з Рыма кароны, зроблены дарагі абклад, кароны аздоблены каштоўнымі камянямі, падараванымі Ганнай Сангушкай. У 1660 абраз вывозілі ў Быценскі кляштар базыльян, у 1915 — у Маскву, адкуль ён вярнуўся без большасці аздоб. З яго шматразова рабіліся жывапісныя копіі на дошках і палатне, выконваліся гравюры, найб. вядомая Л.Тарасевіча (1682) па малюнку П.Башэвіча. Абраз пашкоджаны пажарам, верагодна, у 1-й пал. 16 ст. Свята абраза адзначаецца 7(20) мая.

Літ.: Пуцко В. Жыровіцкі рэльеф // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1989. № 2; Жировицкая святыня: (По материалам митрополита Антония Мельникова) // Вестн. Бел. Экзархата. 1990. № 3; Карнілава Л. Цудатворныя абразы Гродзеншчыны: Абраз Маці Божай Жыровіцкай // Гарадзенскія запісы. Гародня, 1993. Вып. 1. *А.А.Яршэвіч.*

ЖЫРО́ВІЦКІ СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧЫ ТЭ́ХНІКУМ. Засн. ў 1945 у в. Жыровічы (Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.). Спецыяльнасці (1997/98 навуч. г.): механізацыя сельскай гаспадаркі; электрыфікацыя і аўтаматызацыя сельскай гаспадаркі. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае і завочнае.

Да арт. **Жыровіцкае евангелле**. Мініяцюра з выявай евангеліста Матфея.

Свята **Жыровіцкага абраза Маці Божай**. Пач. 1990-х г.

ЖЫРО́ВІЦКІ УСПЕ́НСКІ МАНАСТЫ́Р, мужчынскі правасл. манастыр у в. *Жыровічы* Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. Размешчаны на ўзвышаным беразе р. Шчара. Упершыню згадваецца ў 1587, засн. на месцы з'яўлення *Жыровіцкага абраза Маці Божай* (напачатку была пабудавана драўляная, потым мураваная царква). У 1609 манастыр стаў уніяцкім, з 1613 належаў ордэну базыльян і ў 17—19 ст. наз. Жыровіцкі манастыр базыльян. Першым грэка-каталіцкім ігуменам быў І.*Кунцэвіч*. У 1613—18 Д.Солтан, Я.Мялешка і Л.Сапега падарылі манастыру ворныя землі вакол Жыровіч. Тут адбываліся кангрэгацыі (з'езды) базыльян (1629, 1658, 1659, 1661, 1675, 1679, 1694). Пры манастыры існавала школа для свецкіх асоб. Не пазней як з 1709 тут дзейнічалі ніжэйшыя і філас. школы, якія ператвораны *Адукацыйнай камісіяй* у 3-класнае вучылішча. У пач. 19 ст. манастыру належалі фальваркі Боцькаўшчына, Яцукі, частка в. Квасевічы і палавіна в. Ахонава (усяго 376 рэвізскіх душ), у Жыровічах — 19 валок 12 маргоў зямлі. У 1810—28 тут знаходзілася кафедра Брэсцкай уніяцкай епархіі, у 1828—39 — Літ. уніяцкай епархіі. У 1828 на базе пав. вучылішча створана Літ. духоўная семінарыя. Пасля скасавання ў 1839 *Брэсцкай уніі 1596* манастыр зноў стаў праваслаўным. У 1842 амаль усе яго зямельныя ўладанні перададзены ў казну, манастыр залічаны да 2-га класа. Да 1845 тут знаходзілася кафедра Літ. правасл. епархіі і духоўная семінарыя. З сярэдзіны 19 ст. да 1915 дзейнічала Жыровіцкае духоўнае вучылішча. У манастыры былі вял. б-ка з рэдкімі рукапісамі (у т.л. *Жыровіцкае евангелле*) і архіў. З 1945 (з перапынкам у 1963—89) у манастыры дзейнічае Мінская духоўная семінарыя. У 1960—90 на тэр. манастыра часова жылі насельніцы закрытых жаночых манастыроў — Гродзенскага Раства Багародзіцы і Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага. Узначальвае манастыр намеснік у сане епіскапа. Сучасны арх. ансамбль склаўся ў 17—18 ст. На працягу 1629—1828 былі пабудаваны мураваныя Успенскі сабор, Крыжаўзвіжанская і Яўленская цэрквы, званіца, семінарыя (новы будынак узведзены ў 1956), жылы манас-

Да арт. **Жыровіцкі Успенскі манастыр**. Крыжаўзвіжанская царква.

тырскі корпус, гасп. пабудовы, пасаджаны пладовы сад, зроблена сажалка; комплекс часткова абнеслі мураванай сцяной з брамамі. Ансамбль нерэгулярнай планіроўкі, мае маляўнічую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю і выразны шматпланавы сілуэт. У яго архітэктуры спалучаюцца рысы барока, ракако і класіцызму. Ядро кампазіцыі — Успенскі сабор, злучаны крытымі пераходамі з будынкам семінарыі (на Пн) і з жылым корпусам (на Пд), у 1-м паверсе якога зроблены праезд на тэр. манастыра. Будынак семінарыі фарміруе парадны двор перад апсідай сабора. Каля ўсх. крыла семінарыі вял. прамавугольны гасп. двор, абкружаны 1-павярховымі карпусамі. На ПдУ ад сабора Яўленская царква. Ва ўсх. ч. манастыра на самым высокім месцы Крыжаўзвіжанская царква — верт. дамінанта ансамбля. Успенскі сабор, пабудаваны ў 1629—80 як гал. храм манастыра, уяўляе сабой мураваную 3-нефавую крыжова-купальную базіліку (даўж. 55 м, выш. каля 40 м) з паўкруглай апсідай. Да яго прымыкаюць 3 цёплыя прыдзелы: Пакрова Прасвятой Маці Божай, Раства Іаана Хрысціцеля і св. цудатворца Мікалая. Першапачаткова сабор пабудаваны ў стылі барока з 2-вежавым гал. фасадам. Пасля рэканструкцыі 1828 храм набыў рысы класіцызму: вежы разабраны, зменена форма светлавога барабана і купала, у дэкоры выкарыстаны дарычны ордэр (4-калонны порцік з трохвугольным франтонам, фрыз з трыгліфамі). У яго інтэр'еры драўляны разны 3-ярусны іканастас у стылі барока (ракавіны, гірлянды, херувімы, арнамент у выглядзе вінаграднай лазы і лістоў аканта). Плошчу перад саборам фарміруе квадратная ў плане 2-ярусная званіца, звязаная з саборам адзінай падоўжнай планіровачнай воссю. Яе архітэктура заснавана на класічнай ордэрнай сістэме. Крыжаўзвіжанская царква, пабудаваная ў 1769 як уніяцкі храм-кальварыя ў стылі ракако, адназальная, са званіцай над уваходам, без вылучэння апсіды ў самаст. аб'ём. Яе гал. фасад адметны стройнасцю і лёгкасцю 3-яруснай кампазіцыі. 3-і ярус — 4-гранная вежачка з фігурнай барочнай галоўкай. Падобная вежачка і над алтарнай часткай. Яўленская царква, пабудаваная ў 1796 у стылі барока ў цэнтры манастыра, — бязвежавы адназальны храм. Яе гал. 2-ярусны фасад выходзіць за межы асн. аб'ёму. Семінарыя, пабудаваная з паўн.-ўсх. боку сабора ў 17—18 ст. у стылі барока, — П-падобны трохпавярховы будынак з мансардавым дахам, вырашаны ў манум. формах, мае сім. планіровачнае і аб'ёмна-планіровачнае вырашэнне. Жылы корпус, што прымыкае да сабора пры дапамозе надбрамнага пераходу, — вышэйшае 3-павярховы аб'ём галерэйнай планіроўкі. Гаспадарчы корпус — 1-павярховае П-падобнае ў плане збудаванне; з паўн.-зах. фасадам семінарыі ён утварае вял. гасп. двор. У спрошчаным арх.-дэкар. вырашэнні корпуса прасочваюцца матывы барока (фігурны тарцовы шчыт) і класіцызму (карнізныя сухарыкі, франтоны). *А.М.Кулагін* (архітэктура), *А.А.Ярашэвіч* (гісторыя).



Да арт. **Жыровіцкі Успенскі манастыр**. Успенскі сабор.

ЖЫРО́ВІЦКІ ШКО́ЛЬНЫ ТЭ́АТР. Існаваў у сярэдзіне 18 ст. пры базыльянскай семінарыі ў мяст. Жыровічы (цяпер вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл.). Пастаўленыя ў ім драмы на лац. і польск. мовах з бел. інтэрмедыямі карысталіся папулярнасцю ў гледачоў. Вядома пра пастаноўкі ў тэатры лац. трагедыі «Цыцэрон» С.Навіцкага з музыкай мясц. кампазітара Б.Згіроўскага (1752), польска-бел. уніяцкай інтэрмедыі «Сляпы, кульгавы, потым пан і селянін» (1751) і інш.

ЖЫРО́ВІЧЫ, Жыровіцы, вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл., каля р. Шчара, на аўтадарозе, што злучае Слонім з аўтадарогай Мінск—Брэст. Цэнтр сельсавета. За 10 км на Пд ад горада і чыг. ст. Слонім, 138 км ад Гродна. 2577 ж., 646 двароў (1997).

Вядомы з 2-й пал. 15 ст. як уладанне, аддадзенае вял. кн. ВКЛ Казімірам Ягелончыкам літ. падскарбію А.Солтану. У 16 ст. заснаваны *Жыровіцкі Успенскі манастыр*. З 1610-х г Ж. — уласнасць Л.Сапегі, потым Я.Мялешкі. З 17 ст. мястэчка, у 1652 атрымалі магдэбургскае права. З 1795 у Рас. імперыі, у Слонімскім пав. У 1880-я г. больш за 300 ж. З 1921 у складзе Польшчы, у Слонімскім пав. Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета Слонімскага р-на. У 1971 — 2597 ж., 430 двароў.

Дзярж. сортавыпрабавальная станцыя. *Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Мінская вышэйшая духоўная семінарыя*. Сярэдняя і муз. школы. 2 дамы культуры, 2 б-кі, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму. Помнікі архітэктуры — Георгіеўская царква (канец 18 ст.) і *Жыровіцкі манастыр базыльян*.

ЖЫРО́НДА (Gironde), эстуарый рэк Гарона і Дардонь у Францыі, адкрываецца ў Біскайскі заліў. Даўж. 75 км, шыр. да 10 км, у ніжняй ч. глыб. да 35 м, у верхняй, больш вузкай, шмат пясчаных меляў і астравоў. Найменшая глыб. на фарватэры 8 м. Прылівы паўсутачныя, выш. да 5,2 м. У вусці Ж. — порт Ле-Вердон-сюр-Мер і марскі курорт Руаян.

ЖЫСКА́Р Д'ЭСТЭ́Н (Giscard d'Estaing) Валеры (н. 2.2.1926, г. Кобленц, Германія), дзяржаўны і паліт. дзеяч Францыі. Скончыў Політэхнічны ін-т і Нац. ін-т адм. кадраў у Парыжы. У 1956—76 і 1984—89 чл. Нац. сходу. У 1962—66 і 1969—74 міністр эканомікі і фінансаў. У 1974—81 прэзідэнт Францыі. У знешняй палітыцы выступаў за інтэграцыю Францыі ў Еўрап. супольніцтва, падтрымліваў добрыя сувязі з ЗША і СССР; ва ўнутр. палітыцы імкнуўся знізіць узровень беспрацоўя і інфляцыі, кіраваў праграмай мірнага выкарыстання атамнай энергіі. Сузаснавальнік і ў 1966—73 старшыня партыі Нац. федэрацыя незалежных рэспубліканцаў, у 1977 заснаваў і з 1988 узначаліў Саюз за франц. дэмакратыю. З 1989 дэпутат Еўрапарламента. Аўтар успамінаў «Улада і жыццё» (т. 1—2, 1988—91).

ЖЫ́ТА (Secaled), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. злакаў. 6—8 відаў. Вырошчваюць (з 1—2-га тыс. да н.э.) пераважна ў краінах Паўн. паўшар'я Ж. пасяўное (S. cereale) — азімыя і яравыя формы. На Беларусі Ж. азімае — адна з найважнейшых збожжавых і кармавых прамежкавых культур.

Ж. пасяўное — аднагадовая расліна выш. 60—180 см. Каранёвая сістэма валасніковіс-

тая, магутная. Сцябло — саломіна, лісце лінейна-ланцэтнае. Каласы шчыльныя, двухрадковыя, пры выспяванні шэра- або светла-жоўтыя. Каласкі двухкветныя, каласковыя лускавінкі завостраныя, з кароткім асцюком. Зярняўкі маршчакаватыя, з глыбокай баразёнкай і невял. чубком. Зерне мае 9—13% бялкоў, 55—70 крухмалу, 1—2% тлушчу, вітаміны B_1, B_2, PP. Самая марозаўстойлівая культура сярод азімых злакаў, пераносіць кароткатэрміновыя маразы да -20 °С (на глыб. вузла кушчэння). Перыяд актыўнай вегетацыі 140—170 сутак. Раянаваныя сарты бел. селекцыі: тэтраплоідныя — Пухаўчанка, Верасень, Ігуменская; дыплоідныя — Радзіма, Калінка.

Літ.: Мухін М.Дз. Азімае жыта. Мн., 1969; Кобылянский В.Д. Рожь. М., 1982.

ЖЫ́ТКАВІЦКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з сак. да ліст. 1942 у г.п. Жыткавічы Гомельскай вобл. Аб'ядноўвала 20 чал. (кіраўнік Е.Я.Гораў), мела сувязь з партыз. і дыверсійна-разведвальнай групамі. Падпольшчыкі вялі агітацыю сярод салдат ворага, распаўсюджвалі лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, здабывалі для партызан бланкі ням. дакументаў, медыкаменты, звесткі пра рух воінскіх эшалонаў і ахову чыгункі, размяшчэнне войск праціўніка. Пусцілі пад адхон 9 эшалонаў ворага. Пасля арышту кіраўніка і некалькіх удзельнікаў падполля патрыёты пайшлі да партызан.

ЖЫ́ТКАВІЦКАЕ РАДО́ВІШЧА БУ́РАГА ВУ́ГАЛЮ, у Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл., на ПнЗ ад г. Жыткавічы. Выяўлена ў 1969 у адкладах неагену. Аб'ядноўвае 4 збліжаныя самаст. вугальныя паклады. Магутнасць вугальнага пласта 0,3—15,6 м, глыб. залягання 12,4—44,4 м. Вугалі гумусныя (марка 1Б). Сярэдняя цеплыня згарання 6,2—7,2 МДж/кг. Сярэдняя попельнасць 18,5%. На пл. 16,9 км² запасы вугалю 69,1 млн. т. Радовішча не распрацоўваецца. *А.П.Шчураў.*

ЖЫ́ТКАВІЦКІ, біялагічны заказнік на тэр. Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Створаны ў 1978 як бат. заказнік рэсп. значэння для аховы прыродных запасаў лек. раслін. Пл. 15 тыс. га (1997). Займае лясны масіў, у якім пераважаюць чарнічныя хвойнікі, трапляюцца бярэзнікі, зрэдку чорнаалешнікі. Асн. лек. расліны: чабор, талакнянка, рабіна, чарніцы і інш.

ЖЫ́ТКАВІЦКІ РАЁН, на З Гомельскай вобл. Утвораны 17.7.1924 (у сучасных межах з 1962). Пл. 2,9 тыс. км². Нас. 51,2 тыс. чал. (1997), гарадскога 41,5%. Сярэдняя шчыльнасць нас. 17,7 чал. на 1 км². Цэнтр раёна — г. *Жыткавічы*; г.п. Тураў, 108 сельскіх населеных пунктаў. Падзяляецца на 13 сельсаветаў: Азяранскі, Браніслаўскі, Верасніцкі, Дзякавіцкі, Ленінскі, Людзяневіцкі, Марохараўскі, Мілевіцкі, Пераройскі, Руднянскі, Рычоўскі, Чырвоненскі, Юркевіцкі.

Тэр. раёна ў межах *Прыпяцкага Палесся*. Паверхня нізінная, плоская, забалочаная, мае нахіл з Пн на Пд да даліны р. Прыпяць. Амаль уся тэр. на выш. 120—145 м. Найвыш. пункт 184,1 м (на У, ва ўрочышчы *Бялёва* ка-



ля в. Бялёў). Карысныя выкапні: буры вугаль, сапрапель, торф, пяскі, гліны, каалін, пясчана-жвіровыя сумесі, гаручыя сланцы, граніт, гнейсы акварцаваныя. Сярэдняя т-ра студз. -5,9, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 584 мм за год. Вегетац. перыяд 197 сут. Гал. рэкі: Прыпяць з прытокамі Случ, Скрыпіца з Навуццю, Сцвіга, Свінавод. Азёры Чырвонае і Белае. Пераважаюць глебы поймавыя (26,7%), тарфянабалотныя (26%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (20,3%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (16,7%). Пад лесам 56,3% тэр. Найб. лясістасць на Пн, З і У; лясы хваёвыя, бярозавыя, чорнаальховыя і дубовыя. Балоты займаюць 2,5% тэр. Найб. балотныя масівы *Булеў Мох*, Межч, Смалярня і інш. Пд раёна заняты *Прыпяцкім нацыянальным паркам*. Заказнікі: біялагічныя Жыткавіцкі, «Нізоўе Случы», Ленінскі паляўнічы. Помнік прыроды — Вятчынскае насаджэнне рададэндрану жоўтага (пантыйская азалія).

Агульная плошча с.-г. угоддзяў 69,6 тыс. га, з іх асушана 33,5 тыс. га. На 1.1.1997 у раёне 11 калгасаў, 6 саўгасаў, рыбныя гаспадаркі «Белае» і «Чырвоная зорка». Асн. галіна сельскай гаспадаркі — мяса-малочная жывёлагадоўля. Вырошчваюць збожжа і бульбу. Прадпрыемствы лясной (лясгас, Тураўскі леспрамгас), тарфяной (*Жыткавіцкі торфабрыкетны завод*), металаапр. (маторабуд. з-д, «Пратон»), харч. (цэх малочнай прадукцыі і кансервавы з-д у Тураве, масларобчы з-д, рыбазавод «Чырвонапалескі» ў в. Пухавічы), буд. прам-сці. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Брэст—Гомель і аўтадарогі Брэст—Гомель, Мінск—Мікашэвічы, Жыткавічы—Столін. Суднаходства па р. Прыпяць. У раёне 20 сярэдніх, 16 базавых, 13 пачатковых школ, прафес.-тэхн. вучылішча, 31 дашкольная ўстанова, 67 клубаў, 61 б-ка, 4 бальніцы, 5 паліклінік, 35 фельч.-ак. пунктаў. Тураўскі краязнаўчы музей. Помнікі архітэктуры: Усясвяцкая царква (1810) і помнік Кірылу Тураўскаму (1993) у г.п. Тураў.

С.І.Сідор.

ЖЫ́ТКАВІЦКІ ТОРФАБРЫКЕ́ТНЫ ЗАВО́Д. Пабудаваны ў 1982 ў п. Чырвонае Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. на базе торфапрадпрыемства «Чырвонае» (1971). Спецыялізуецца на выпуску торфабрыкету. З 1996 разам з ВА «Беларусьнафта» вырабляе сарбенты для утылізацыі разліваў нафты на вадзе і зямлі. Сыравінная база — радовішча торфу *Булеў Мох* у Салігорскім і Жыткавіцкім р-нах. Пачатковыя прамысл. запасы торфу 46 800 тыс. т, на 1.1.1997 — 2800 тыс. т.

ЖЫ́ТКАВІЧЫ, горад, цэнтр Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Чыг. ст. на лініі Гомель—Лунінец. За 238 км ад Гомеля. Аўтадарогамі злучаны з Брэстам і Калінкавічамі. 17,7 тыс. ж. (1997).

У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1500 як маёнтак Жыдкавічы. У канцы 16 ст. вёска ў Мазырскім пав. ВКЛ. З 1793 у Рас. імперыі. У 19 ст. цэнтр воласці. З буд-вам Палескай чыг. і адкрыццём у 1886 чыг. станцыі на месцы вёсак Зарэчча і Бярэжа пачаў расці рабочы пас. Ж., заснаваны лесапільны з-д. У 1897 — 1200 ж., нар. 2-класнае вучылішча, аптэка, пошта, царква. З 1924 цэнтр *Жыткавіцкага раёна*. З 27.9.1938 гар. пасёлак. У 1939 — 4,3 тыс. ж. У Вял. Айч. вайну з 20.8.1941 па 6.7.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў Ж. і раёне

Горад **Жыткавічы**. Вуліца Энгельса.

Жыта пасяўное.

1384 чал., разбураны. Дзейнічала *Жыткавіцкае патрыятычнае падполле*. З 1954 у Гомельскай вобл. 5,4 тыс. ж. у 1959, 7,9 тыс. ж. у 1970. З 19.11.1971 горад.

Прадпрыемствы лесанарыхтоўчай, харч. прам-сці. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ЖЫТКО́Ў Барыс Сцяпанавіч (11.9.1882, г. Ноўгарад, Расія — 19.10.1938), рускі пісьменнік. Скончыў Новарасійскі ун-т у Адэсе (1906), Петраградскі політэхн. ін-т (1916). Працаваў іхтыёлагам, капітанам н.-д. судна, штурманам парусніка, рабочым-металістам, кіраўніком тэхн. вучылішча, быў марскім афіцэрам і інш. Друкаваўся з 1924. Аўтар марскіх аповесцей (зб-кі «Злое мора», 1924; «Марскія гісторыі», 1925—37), п'ес («Пяты мост», 1927, «Сем агнёў», 1929), навук.-маст. кніг («Пра гэтую кнігу», 1927, «Параход», 1935, і інш.), «Апавяданняў пра жывёл» (1935). Стварыў дзіцячую аповесць-энцыклапедыю «Што я бачыў» (1939) і інш. На бел. мову творы Ж. пераклаў С.Міхальчук і інш.

Тв.: Избранное. М., 1988; Рассказы о животных. М., 1988; Что я видел. М., 1993; Бел. пер. — Пра малпачку. Вільня, 1933; Марскія гісторыі. Мн., 1938; Марскія гісторыі. М., 1961.

Літ.: Жизнь и творчество Б.С.Житкова. М., 1955; Чуковская Л. Борис Житков. М., 1955; Черненко Г.Т. Вечный Колумб. Л., 1982. *І.У.Саламевіч.*

ЖЫТНЯ́К (Agropyron), род кветкавых раслін сям. метлюжковых. Каля 15 відаў. Пашыраны ў Еўропе (пераважна ў Міжземнамор'і), Паўн. Афрыцы, Азіі, Аўстраліі, Новай Зеландыі. На Беларусі

Жытняк грэбенепадобны.

як занесены і натуралізаваны трапляецца Ж. грэбенепадобны (A. pectinatum). Расце каля дарог, на пустках, газонах і інш.

Шматгадовыя травяністыя расліны з прамастойным звычайна слабашурпатым сцяблом і моцнай валасковістай каранёвай сістэмай. Лісце вузкае, лінейнае, іншы раз уздоўж згорнутае, часта з тонкімі шыпікамі. Агульнае суквецце — яйцападобны, падоўжаны ці лінейны сціснуты двухрадны колас. Каласкі адзіночныя, сядзячыя, з 3—10 кветкамі. Плод — зярняўка. Кармавыя і дэкар. расліны, замацоўваюць рухомыя пяскі.

Г.У.Вынаеў.

ЖЫ́ТНЯЯ БА́БА, у бел. нар. *дэманалогіі* маці жыта; жаночая паралель «гаспадара» поля — *жыценя*. Яе ўяўлялі ў выглядзе фантаст. жанчыны з каласамі на галаве і зоркамі па баках. У некаторых мясцінах «бабаю» называлі апошні сноп зжатага жыта, які апраналі ў жаночую кашулю, завязвалі на ім хустку, урачыста неслі ў хату і спявалі «спарышовыя» песні з пажаданнем добрага ўраджаю ў наступным годзе.

ЖЫТО́МІР, горад на Украіне, цэнтр Жытомірскай вобл., на р. Цецераў (бас. Дняпра). Засн. ў 884. 303 тыс. ж. (1994). Чыг. вузел. Аэрапорт. Прам-сць: машынабуд. і металаапр. (ВА «Электравымяральнік», з-ды станкоў-аўтаматаў, «Прамаўтаматыка», быт. прыбораў і інш.), хім. і фармахім. (з-ды хім. валакна, перапрацоўкі лекавай раслінай сыравіны), лёгкая (ільнокамбінат, ф-кі панчошная, футравая, нятканай тканіны, абутковая, швейных вырабаў), харч., дрэваапр., вытв-сць будматэрыялаў. 2 ВНУ (пед. і с.-г. ін-ты). Тэатры: муз.-драм. і лялек. Музеі: гісторыі касманаўтыкі, прыроды, дамы-музеі У.Г.*Караленкі* і С.П.*Каралёва* (нарадзіліся ў Ж.). Касцёл бернардзінцаў (17—18 ст.), кафедральны касцёл (1744), дом магістрата (1789), Дом культуры (1859), кафедральны сабор (1866—74).

«ЖЫТО́МІР», рачны *манітор* сав. Пінскай ваен. флатыліі, які ўдзельнічаў у абарончых баях на Беларусі і Украіне на пач. Вял. Айч. вайны. Пабудаваны ў 1920 у г. Гданьск. Да 24.10.1939 наз. «Piński» («Пінск»), уваходзіў у склад Віслінскай (1920—25) і Пінскай (1926—39) флатылій ВМФ Польшчы. Затоплены экіпажам у час паходу Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь. Падняты сав. маракамі са дна Прыпяці. Меў на ўзбраенні 3 гарматы і 4 кулямёты, экіпаж каля 40 чал. З ліп. 1941 вёў баі на Бярэзіне (каля Бабруйска) і Дняпры (Кіеўскі напрамак). Узараны экіпажам 1.9.1941 каля в. Чэрні Кіеўскай вобл. ў сувязі з адступленнем сав. войск.

Літ.: Локтионов И.И. Пинская и Днепровская флотилии в Великой Отечественной войне. М., 1958. *Р.К.Паўловіч.*

ЖЫТО́МІРСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. На Пн Украіны. Утворана 22.9.1937. Пл. 29,9 тыс. км². Нас. 1,5 млн. чал., гарадскога 53% (1996). Цэнтр — г. *Жытомір*. Найб. гарады: Бярдзічаў, Карасцень, Навагрудак-Валынскі, Карастышаў, Малін, Оўруч.

Прырода. Паўд. і паўд.-зах. часткі вобласці знаходзяцца ў межах Прыдняпроўскага ўзв. (выш. да 300 м). Пн і ПнУ займае Палеская нізіна і Оўручскае ўзв. (найб. выш. 316 м). Карысныя выкапні: граніты, гнейсы, лабрадарыты, мармур, вапнякі, гліны, жал. і тытанавыя руды, буры вугаль, торф, мінер. воды. Клімат умераны кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -5,6 °С, ліп. 18,7 °С. Гадавая колькасць ападкаў ад 500 мм на Пд да 600 мм на Пн. Гал. рэкі належаць да бас. Дняпра: Цецераў, Ірпень, Случ, Уж, Убарць. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя, на Пд шэрыя лясныя і чарназёмныя. Лясы мяшаныя (хвоя, дуб, граб, бяроза, асіна), займаюць 31,7% тэр., у Ж.в. — Палескі запаведнік.

Гаспадарка Ж.в. адносіцца да індустрыяльна-аграрных раёнаў Украіны. Развіццё прам-сці грунтуецца на с.-г. сыравіне, мясц. мінер. і працоўных рэсурсах. Асн. галіны прам-сці: харчасмакавая (цукр., спіртавая, мясная, масласыраробчая, агароднінакансервавая, піваварная), маш.-буд. (хім. абсталяванне, дарожныя і с.-г. машыны, электрапрылады), лёгкая (тэкст., швейная, абутковая), хім., мікрабіял., дрэваапр., мэблевая, фарфора-фаянсавая, шкляная. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Здабыча бурага вугалю. Пасевы збожжавых (пшаніца, ячмень, жыта) і тэхн. (лён, буракі, хмель) культур. Вырошчваюць бульбу, агародніну. Пладаводства. Мяса-малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля. Пчалярства, рыбагадоўля. Па тэр. вобласці праходзяць чыгункі Адэса—С.-Пецярбург, Харкаў—Львоў, Брэст—Кіеў, Масква—Чоп, аўтадарогі Кіеў—Львоў, Вінніца—Мазыр, Кіеў—Брэст. *П.І.Рогач.*

ЖЫ́ЎКАЎ Тодар Хрыстаў (н. 7.9.1911, с. Правец Сафійскай акр., Балгарыя), палітычны і дзярж. дзеяч Балгарыі. Герой Сац. Працы Нар. Рэспублікі Балга-

рыі (1961), двойчы Герой НРБ (1971, 1981), Герой Сав. Саюза (1977). З 1932 чл. Балгарскай камуніст. партыі (БКП). Адзін з кіраўнікоў *Вераснёўскага народнага ўзброенага паўстання 1944* у Балгарыі. З 1945 канд., з 1948 чл. ЦК БКП. У 1948—49 1-ы сакратар Сафійскага гаркома БКП, з 1950 сакратар, з 1951 чл. Палітбюро ЦК БКП. Ген. сакратар (у 1954—81 1-ы сакратар) ЦК БКП, адначасова старшыня Савета Міністраў НРБ (1962—71). З 1971 старшыня Дзярж. савета НРБ. У снеж. 1989 выключаны з БКП і зняты з усіх пасад. У 1994 асуджаны на 7 гадоў зняволення па абвінавачанні ў растраце дзярж. сродкаў, знаходзіўся пад хатнім арыштам; у 1996 апраўданы.

ЖЫЎЛЕ́ННЕ РАСЛІ́Н, працэс паглынання і засваення пажыўных рэчываў раслінамі; састаўная частка *абмену рэчываў*. Паводле тыпу жыўлення іх падзяляюць на *аўтатрофы* (самі сінтэзуюць арган. рэчывы) і *гетэратрофы* (выкарыстоўваюць гатовыя арган. рэчывы). Некат. расліны з розным тыпам жыўлення існуюць у *сімбіёзе*. Неабходныя для сінтэзу арган. злучэнняў пажыўныя рэчывы расліны, як правіла, паглынаюць у форме вуглякіслага газу (гл. *Фотасінтэз*), вады (гл. *Водны рэжым раслін*) і іонаў мінер. солей. Корань як орган жыўлення прыстасаваны да паглынання солей і вады з глебы, ліст засвойвае вуглякіслы газ з паветра. Мех. і функцыян. сувязь паміж імі ажыццяўляецца сцяблом. Корань, сцябло і ліст пранізаны бесперапыннай сістэмай праводзячых пучкоў, па якіх транспартуюцца прадукты фотасінтэзу з ліста ў корань, а вады і іонаў пажыўных солей з кораня ў ліст. Насякомаедныя расліны атрымліваюць дадатныя, пераважна азоцістыя, арган. рэчывы шляхам ператраўлівання насякомых.

ЖЫ́ХАР Георгій Іосіфавіч (н. 15.3.1936, в. Засулле Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне цеплаэнергетыкі. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1993). Скончыў БПІ (1960). З 1967 у Бел. політэхн. акадэміі. Навук. даследаванні па распрацоўцы і ўдасканаленні метадаў і спец. прыстасаванняў для эфектыўнага спальвання вадкага паліва і газу і зніжэння шкодных выкідаў у навакольнае асяроддзе.

Тв.: Расчетное исследование горения жидкого топлива в циклонной камере // Изв. вузов. Энергетика. 1982. № 6; Расчетное исследование двухступенчатого сжигания жидкого топлива (разам з Л.А.Тарасевічам) // Там жа. 1992. № 5—6.

ЖЫ́ХАРАЎ Георгій Іванавіч (30.11.1915, г. Слаўгарад Магілёўскай вобл. — 14.4.1973), бел. дырыжор, балалаечнік, дамрыст, педагог, дзеяч самадз. мастацтва. Скончыў Бел. кансерваторыю (1951), выкладаў у ёй (1963—73). У 1924—38 арганізатар і кіраўнік аматарскіх аркестраў у Гомелі, выступаў як саліст-балалаечнік (у т.л. на Гомельскім радыё). З 1939 кіраўнік арк. групы Ансамбля песні і танца БВА, у 1945—71 кіраўнік і саліст Секстэта домраў Бел. радыё. Арганізатар і кіраўнік шматлікіх вучэбных і аматарскіх аркестраў у Бел. кансерваторыі, Мінскім муз. вучылішчы, муз. школах, БДУ. Майстар аранжыроўкі і інструментоўкі, прапагандыст твораў бел. кампазітараў і нар. музыкі. Сярод аранжыровак: сімфоніі Ф.Шуберта, В.Каліннікава, С.Пракоф'ева, С.Васіленкі, інстр. канцэрты Э.Грыга, М.Будашкіна, Дз.Смольскага, Ю.Шышакова. Аўтар апрацовак бел. нар. песень і мелодый. Сярод яго вучняў Г.*Асмалоўская*, М.Лісіцын, У.Перацяцька, Л.*Смялкоўскі*. Дыпламант Усесаюзнага агляду-конкурсу (1939, Масква).

Літ.: Таірава Л. Свята памяці // Мастацтва. 1996. № 4; Шчарбак В.М. Вялікі майстар у галіне народнай музыкі // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1993. Вып. 12. *Г.В.Асмалоўская.*

ЖЫ́ЦЕНЬ, у бел. нар. *дэманалогіі* «гаспадар» поля (яго жаночая паралель — *жытняя баба*). Ж. ўяўлялі ў выглядзе маленькага дзядка («жытні дзед») з доўгай барадой. Лічылася, што ён забяспечваў ураджай жыта («даваў жыта»), збіраў каласы на жытняй ніве нядбайнай гаспадыні і пераносіў іх на поле руплівай жняі. Яго шанавалі таксама як духа багацця і дабрабыту. З вобразам Ж. звязаны земляробчы абрад «*завіванне барады*».

ЖЫ́ЦЕЦ, кветкавая расліна, тое, што *цімафееўка*.

ЖЫЦІЁ, агіяграфія, від рэліг. л-ры, апавяданне пра жыццё духоўнай ці свецкай асобы, кананізаванай хрысціянскай царквой.

Ж. ўзніклі ў Рымскай імперыі ў першыя стагоддзі хрысціянства. Складваліся па пэўнай схеме, вызначаліся ўмоўнасцю, дыдактыкай, царк.-рэліг. фантастыкай (прывіды, цуды). Услаўлялі аскетызм, цярплівасць, рэліг. фанатызм і былі сродкам царк. і паліт. прапаганды. Некаторыя ўвабралі сюжэты дахрысц. міфаў, сярэдневяковых навел, анекдотаў і самі сталі крыніцай легенд, духоўных вершаў, народных драм. У Кіеўскую Русь перайшлі ў 10—11 ст. з Візантыі (гл. ў арт. *Візантыя*, раздз. Літаратура) і шырока бытавалі на землях усх. славян у зб-ках *Мінеі чэцці* (пашыраныя), пралогі (кароткія) і *пацерыкі* (у іх аснове займальныя эпізоды з жыцця манахаў). Арыгінальныя Ж. ў Кіеўскай Русі з'явіліся ў 11 ст.: княжацкія з паліт. тэндэнцыяй (такі від Ж. невядомы ў Візантыі) — Ж. Барыса і Глеба (11 ст.), Вольгі, Уладзіміра (12 ст.), Аляксандра Неўскага (13 ст.), Дзмітрыя Данскога (14 ст.); царкоўныя — «*Жыціе Феадосія Пячэрскага*», «*Жыціе Аўрамія Смеленскага*», «Кіева-Пячэрскі пацярык» і інш.

Арыгінальныя бел. Ж. вядомы з канца 12—13 ст. — «*Жыціе Ефрасінні Полацкай*», «*Сказанне пра віленскіх пакутнікаў Іаана, Антонія, Яўстафія*». Іх аўтары не прытрымліваліся візант. схемы, звярталіся да гіст. фактаў, уключалі эмац.-псіхал. маналогі, бытавыя замалёўкі. З перакладных папулярных на Беларусі былі «*Жыціе Аляксея, чалавека божага*» і зб. «*Жыції святых*». Вядомы таксама Чэцці камянецкая і жыровіцкая (15 ст.), слуцкая (16 ст.), супрасльскія рукапісная і друкаваная «Мінея агульная» (17 ст.), пралогі і пацерыкі (віленскія, супрасльскія і інш. 15—17 ст.). У Ж. шмат каштоўнага гіст. матэрыялу, яны маюць вял. пазнавальнае значэнне.

Публ.: Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994. *Л.Л.Кароткая.*

«ЖЫЦІЁ АЛЯКСЕ́Я, ЧАЛАВЕ́КА БО́ЖАГА», помнік бел. перакладной агіяграфічнай л-ры канца 15 ст. Змешчана ў рукапісным зб-ку разам з «*Страсцямі Хрыстовымі*» і «*Аповесцю пра трох каралёў*». Перакладзена з лац. мовы з выкарыстаннем чэш. крыніц. Шырока адлюстроўвае рысы бел. нар. гаворкі свайго часу.

«Жыціе...» апавядае пра Аляксея, які ў імя веры пакінуў багатых бацькоў і жонку і стаў хрысціянскім падзвіжнікам. Пасля вярнуўся ў бацькоўскі дом пад выглядам жабрака і жыў так 17 гадоў. Толькі пасля яго смерці бацькі даведаліся, што гэта быў іх сын. Аповесць вядома ў чэш. і польскім перакладах, у празаічным, вершаваным і драматургічным варыянтах. Зборнік зберагаецца ў Расійскай нац. б-цы ў С.-Пецярбургу.

Публ.: Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн., 1959; Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Ч. 1. Мн., 1961.

Літ.: Адрианова В.П. Житие Алексея, человека божия, в древней русской литературе и народной словесности. Пг., 1917.

У.М.Свяжынскі.

«ЖЫЦІЁ АЎРА́МІЯ СМАЛЁНСКАГА», помнік стараж.-рус. агіяграфічнай л-ры. Напісаны каля 1240 манахам Селішчанскага манастыра (каля Смаленска) Яфрэмам у жанры *аповесці старажытнарускай*. Найб. раннія спісы пач. 16 ст.

Аўтар — паплечнік Аўрамія — апісвае яго жыццё ад нараджэння ў багатай сям'і ў Смаленску і да скону. Пасля смерці бацькоў Аўрамій раздаў сваю маёмасць бедным і стаў манахам Селішчанскага манастыра, дзе сабраў вакол сябе кніжнікаў, перапісваў і пашыраў кнігі. Яго высокая адукаванасць, талент прапаведніка выклікалі зайздрасць мясц. духавенства, манахаў, гарадскіх улад. Аўрамій цярпеў здзекі. І ўсё ж стаў агульнапрызнаным.

У «Жыціі...» створаны новы тып хрысц. героя, які канфліктуе не з язычнікамі, а з адзінаверцамі, якія адмоўна ставяцца да інтэлектуальна вышэйшай за іх асобы. Паказана і грамадскае жыццё Смаленска — культ. цэнтра, звязанага з гісторыяй Беларусі.

Публ.: Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994. *А.Ф.Коршунаў.*

«ЖЫЦІЁ ЕФРАСІ́ННІ ПО́ЛАЦКАЙ», помнік бел. агіяграфічнай л-ры 12—13 ст. (дайшоў спіс 14 ст.); адзін з найб. ранніх твораў гістарычнай прозы на Беларусі. Напісана царк.-слав. мовай стараж.-рус. рэдакцыі. Аўтар невядомы. У творы апавядаецца пра жыццё і культ.-асветніцкую дзейнасць *Ефрасінні Полацкай*, першай жанчыны на Русі, якую царква кананізавала ў святыя. У помніку паўстае вобраз настойлівай і самаахвярнай жанчыны, сапраўднай гераіні свайго часу, услаўляецца яе імкненне да ведаў і духоўнай дасканаласці. Літаратурны схематызм (вобраз Ефрасінні ідэалізаваны, пазбаўлены многіх індывід. рыс жывога чалавека) і дыдактычная

рытарычнасць прыглушаюцца яркімі рэаліямі часу, жыццёвай праўдзівасцю апавядання, якое грунтуецца на сапраўдных гіст. фактах. Важнае месца ў творы займаюць дыялогі і маналогі-разважанні, якія памагаюць раскрыць унутр. свет герояў. У помніку ёсць цікавыя звесткі пра Полацк, яго культ. жыццё, побыт княжацкай сям'і. Твор спалучае некалькі літ. жанраў: гіст.-маст. біяграфію гераіні (*жыціе*), сціслае апісанне яе падарожжа ў «святую зямлю» (хаджэнне) і пахвалу. Рукапіс зберагаецца ў Расійскай нац. б-цы ў С.-Пецярбургу.

Публ.: Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994. *В.А.Чамярыцкі.*

«ЖЫЦІЁ ФЕАДО́СІЯ ПЯЧО́РСКАГА», адзін з самых ранніх помнікаў стараж.-рус. агіяграфічнай л-ры. Напісана каля 1091 *Нестарам*, надрукавана ў 1635 у «Патэрыконе...» С.Косава. У творы ігумен Кіева-Пячэрскага манастыра пісьменнік-палеміст Феадосій паказаны як актыўны праціўнік феад. міжусобіц, імкненняў Візантыі падпарадкаваць сваю ўладу Кіеўскую Русь. Дзейнасць Феадосія, які выкрываў своекарыслівасць і прагнасць манахаў, патрабаваў ад іх аскетычнага і працоўнага жыцця, ладу, імпанавала аўтару. Мова твора эмац. насычаная, лаканічная, ёсць дакладнае апісанне значных гіст. падзей, названы імёны многіх рэальных асоб. Твор быў шырока вядомы на Беларусі.

А.Ф.Коршунаў.

«ЖЫЦІЙ СВЯТЫ́Х», помнік бел. перакладной агіяграфічнай л-ры 17 ст. Перакладзены з польскай мовы. Першакрыніца — «Жыціі святых» П.Скаргі. Вядомы тры скарочаныя бел. пераклады. Найб. поўны (141 жыціе) створаны ў 2-й пал. 17 ст., відаць, у Магілёве, захаваў многія літ. асаблівасці арыгінала. Бел. перакладчыкі выбіралі творы пра найб. вядомых «святых», часам уносілі змены ў тэксты (апускалі выпады супраць праваслаўных і пратэстантаў, пахвалы рымска-каталіцкаму касцёлу і інш.). Творы ў зборніку маюць сяродневяковы рэліг.-аскетычны, дыдактычны характар, схематычныя вобразы, але дзякуючы багаццю зместу, даходлівасці выкладу былі папулярныя сярод бел., польскіх і ўкр. чытачоў.

Літ.: Гудзий Н.К. Переводы «Żywotów świętych» Петра Скарги в Юго-Западной Руси. Киев, 1917; Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994. *В.А.Чамярыцкі.*

ЖЫ́ЦІК (Lolium), род кветкавых раслін сям. метлюжковых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў Еўропе (пераважна ў Міжземнамор'і), Паўн. Афрыцы і Азіі. На Беларусі як занесеныя, натуралізаваныя і пустазелле трапляюцца Ж. п'янючы (L. temulentum), расстаўлены, або льняны (L. remotum), жорсткі (L. rigidum), шматкветкавы (L. multiflorum) і шматгадовы (L. perenne). Ж. шматкветкавы і шматгадовы пад назвай *райграс* уведзены ў культуру як кармавыя і газонныя расліны. Некат. віды — пустазелле; ёсць ядавітыя. Растуць каля дарог, на пустках, газонах і інш.

Шмат-, двух- і аднагадовыя травяністыя расліны з прамастойнымі ці ўзыходнімі сцёбламі выш. да 1 м і мочнай валасніковістай каранёвай сістэмай. Лісце вузкалінейнае. Агульнае суквецце — рэдкі лінейны двухрадны колас. Каласкі адзіночныя, сядзячыя, сціснуты з бакоў, з 3—15 кветкамі. Плод — зярняўка. *Г.У.Вынаеў.*

ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭ́ННЕ касманаўтаў, комплекс сістэм і мерапрыемстваў для забеспячэння жыццядзейнасці і працаздольнасці чалавека ў касм. палёце, пры выхадзе ў адкрыты космас і на паверхню нябесных цел. Для стварэння і падтрымання неабходных умоў Ж. ў касм. палёце выкарыстоўваюцца герметычныя кабіны рэгенерацыйнага тыпу і індывід. *скафандры*.

Герметычная кабіна абсталёўваецца сістэмай Ж., якая складаецца з падсістэм: рэгенерацыі паветра, водазабеспячэння, забеспячэння ежай, тэрмарэгулявання, сан.-гігіенічнага забеспячэння. Адрозніваюць сістэмы Ж.: адкрытыя (маюць запасы кіслароду, ежы, вады; адходы жыццядзейнасці складуюцца або выдаляюцца за борт, газападобныя прадукты паглынаюцца фільтрамі), часткова закрытыя (забяспечваюць рэгенерацыю вады, атрыманне кіслароду электролізам вады або раскладаннем вуглякіслага газу), закрытыя (адбываецца кругаварот асн. элементаў і рэчываў з узнаўленнем харч. прадуктаў, рэгенерацыяй вады, кіслароду, утылізацыяй адходаў жыццядзейнасці). Для рэгенерацыі рэчываў і элементаў у сістэме Ж. выкарыстоўваюцца біял. і фіз.-хім. метады. Гл. таксама *Біятэхнічная сістэма*. *Н.А.Ушакова.*

ЖЫЦЦЁ, асобая форма існавання і руху матэрыі, здольная да развіцця (*эвалюцыі*) і якасна больш высокая, чым фіз. і хім. формы; асн. матыў існавання і змест перажывання чалавека, жыццёвы лёс наогул. Характарызуецца *абменам рэчываў*, раздражняльнасцю, самааднаўленнем, сістэмным самакіраванням, перадачай энергіі і інфармацыі, прыстасаванасцю да ўмоў асяроддзя (*адаптацыяй*), а таксама адноснай самастойнасцю надарганізменных утварэнняў (*біягеацэнозаў*, *экасістэм*) пры агульным фізіка-хім. адзінстве жывога рэчыва біясферы Зямлі (магчыма, і ўсяго Сусвету). Існуюць розныя канцэпцыі паходжання і сутнасці Ж. Прыхільнікі *крэацыянізму* прызнаюць аднаактавае стварэнне арганізмаў Богам або шматлікія акты стварэння ўсё больш дасканалых форм Ж. пасля знішчэння папярэдніх у выніку «катаклізмаў». Тэорыя самаадвольнага і спантаннага зараджэння Ж. была пашырана ў Стараж. Кітаі (Канфуцый), Вавілоне і Егіпце. *Віталізм*, які абапіраецца на вучэнне Арыстоцеля аб *энтэлехіі*, растлумачвае працэсы Ж. дзеяннем нематэрыяльнай «энергіі душы», «жыццёвай сілы» або «жыццёвага парыву». Тэорыя біяхім. эвалюцыі прапануе сваю ўсеагульную схему ўзнікнення Ж. ў выніку працяглых пераўтварэнняў вугляродазмяшчальных злучэнняў, пераходу ад складаных арган. рэчываў да простых жывых арганізмаў; паводле палеанталагічных звестак, першыя жывыя арганізмы (аднаклетачныя) з'явіліся на Зямлі не менш як 3,5—3,8 млрд. гадоў назад. На глебе метафізічнага матэрыялізму распрацоўваліся канцэпцыі пра занясенне зародкаў жыцця на Зямлю з космасу (*панспермія*) і аб спрадвечным паралельным існаванні жывой і нежывой матэрыі. Франц. філосаф А.Бергсон разглядаў Ж. як працэс чалавечага быцця і ўяўляў яго ў форме зыходнага «ўзрыву», які прывёў да разгортвання жыццёвага працэсу; пры гэтым у якасці 2 асн. форм Ж. і пазнання ён вылучаў інтэлект і інтуіцыю. З псіхааналітычнага пункту погляду Ж. ўяўляе сабой узаемадзеянне структурных элементаў псіхікі, жыццядзейнасці індывіда і асаблівасцей навакольнага асяроддзя. На думку З.Фрэйда і Л.Шапенгаўэра, «сапраўдным вынікам» і мэтай Ж. з'яўляецца дасягненне смерці, а сексуальныя схільнасці, якія ўзнаўляюць папярэднія станы праз зліццё дзвюх зародкавых клетак, ёсць увасабленне волі да Ж. Ідэі аб Ж. як рэдкай разнавіднасці смерці ляжаць у аснове канцэпцыі постструктуралізму, прадстаўнікі якога не проціпастаўляюць Ж. смерці, а ўводзяць іх у адносіны невырашальнай узаемаабарачальнасці. Гл. таксама *Абіягенез*, *Гамеастаз*, *Дарвінізм*, *Філасофія жыцця*.

Жыцік расстаўлены.

Літ.: Вернадский В.И. Живое вещество. М., 1978; Фролов И.Т. О смысле жизни, о смерти и бессмертии человека. М., 1985; Зеленков А.И., Водопьянов П.А. Динамика биосферы и социокультурные традиции. Мн., 1987; Стереотипы и динамика мышления. Мн., 1993. *С.Ф.Дубянецкі.*

ЖЫЦЦЁ, рака, гл. *Уздзянка*.

«ЖЫЦЦЁ БЕЛАРУ́СА», газета рэв.-дэмакр. кірунку. Орган *Беларускай сялянска-работніцкай грамады* (БСРГ). Выдавалася 19.8—12.11.1925 у Вільні 3 разы на тыдзень на бел. мове. Асвятляла эканам. і асв. праблемы, задачы, пытанні

стратэгіі і тактыкі вызв. руху ў Зах. Беларусі. Змяшчала матэрыялы пра ўнутр. і знешнюю палітыку Польшчы, аналізавала сац. асновы, эканам. стан і перспектывы развіцця краіны. Узнімала пытанні правоў чалавека ў Зах. Беларусі і Польшчы, змагалася за асвету на роднай мове. Інфармавала пра падзеі культ. жыцця ў БССР, культурна-грамадскі бел. рух у Латвіі, Літве, Чэхаславакіі, Амерыцы. Публікавала маст. творы вядомых і пачынаючых літаратараў. Выйшла 20 нумароў, з іх 5 канфіскаваны. Забаронена польскімі ўладамі. *А.С.Ліс.*

ЖЫЦЦЁВАЯ ЁМІСТАСЦЬ ЛЁГКІХ, максімальны аб'ём паветра, які выдыхаецца пасля самага глыбокага ўдыху. Пры макс. выдыху колькасць газаў у *лёгкіх* памяншаецца да астаткавага аб'ёму (каля 1,5 л), што разам з Ж.ё.л. складае агульную ёмістасць лёгкіх. У норме Ж.ё.л. раўняецца каля 0,75 агульнай ёмістасці і характарызуе макс. аб'ём, у межах якога чалавек можа мяняць глыбіню свайго дыхання. Пры спакойным дыханні здаровы дарослы чалавек удыхае і выдыхае 0,3—0,5 л паветра (т.зв. дыхальны аб'ём). Велічыня Ж.ё.л. у норме залежыць ад полу, узросту, целаскладу, фіз. развіцця чалавека; пры захворваннях істотна памяншаецца. Вызначаюць з дапамогай спіраграфіі, згодна з табліцамі, намаграмамі і формуламі. У мужчын Ж.ё.л. складае 3,5—4,5 л (у добра трэніраваных да 6), у жанчын — 2,5—3,5 л.

ЖЫЦЦЁВАЯ ПРАСТО́РА, 1) сярэдняя плошча, якая прыпадае на адну асобіну дадзенай папуляцыі і забяспечвае нармальнае яе існаванне ў складзе папуляцыі. 2) Тэрыторыя, неабходная для задавальнення ўсіх патрэб аднаго чалавека пры дадзеных грамадска-эканам. умовах. Уключае плошчы, неабходныя для вытв-сці харчавання (па аптымальных мед. нормах), вырошчвання тэхн. культур, буд-ва прамысл. аб'ектаў з іх інфраструктурай (жылых комплексаў, дарог і інш.) і рэкрэацыі. У Ж.п. ўваходзяць буферныя зоны і комплекс падтрымання экалагічнай раўнавагі. Напр., для невял. краін Зах. Еўропы Ж.п. ацэньваецца ў 0,6—0,7 га, для ЗША — 2 га, для вытв-сці харчавання — 0,6 га.

ЖЫЦЦЁВЫ ЦЫКЛ, цыкл развіцця, сукупнасць усіх фаз індывід. развіцця арганізма, у выніку якога ён дасягае спеласці і становіцца здольным даваць патомства. Працягласць Ж.ц. вызначаецца колькасцю пакаленняў (*генерацый*), што развіваюцца на працягу года, або колькасцю гадоў, на працягу якіх ажыццяўляецца адзін Ж.ц.; залежыць таксама ад перыяду спакою або дыяпаўзы, якія ўласцівы дадзенаму арганізму. У жывёл адрозніваюць просты Ж.ц. (прамое развіццё) і складаны (развіццё з *метамарфозам* або з чаргаваннем пакаленняў). Напр., Ж.ц. капуснай бялянкі складаецца з фаз (стадый) развіцця: яйцо — вусень — кукалка — імага; у пячоначнага смактуна ад яйца да дарослага паразіта праходзіць 6 стадый развіцця.

Адзінкай пры вывучэнні Ж.ц. можа быць адзін ці шэраг антагенезаў, што змяняюць адзін аднаго. У вышэйшых раслін адрозніваюць аднагадовы, двухгадовы і шматгадовы Ж.ц. Для Ж.ц. многіх ніжэйшых раслін і папарацей характэрна змена *гаметафіту* і *спарафіту*. У паразітычных грыбоў Ж.ц. па складанасці падобны да паразітычных чарвей, якія развіваюцца са зменай гаспадароў. Сярод прасцейшых найб. складаны Ж.ц. у спаравікоў, напр., у гемаспарыдый. Пра Ж.ц. чалавека гл. ў арт. *Антагенез*.

ЖЫЦЦЁВЫЯ ФО́РМЫ, 1) у жывёл — група асобін, што маюць падобныя морфаэкалагічныя прыстасаванні для пражывання ў аднолькавым асяроддзі. Характэрна змена Ж.ф. у антагенезе для відаў, развіццё якіх ідзе з метамарфозам (ад лічынкі да дарослага насякомага). У аснове класіфікацыі жывёл — асаблівасці размнажэння, эколага-марфал. прыстасаванні, спосабы перамяшчэння, здабычы ежы і яе характар, аднесенасць да ландшафту, ступень актыўнасці і інш. 2) Ж.ф. ў раслін — вонкавы выгляд (*габітус*), які адлюстроўвае іх прыстасаванасць да ўмоў асяроддзя; адзінка экалагічнай класіфікацыі. Складаюцца ў выніку *натуральнага адбору* ў пэўных умовах асяроддзя. Ж.ф. груп раслін адлюстроўваюць іх прыстасаванасць да рассялення і замацавання на тэрыторыі, да найб. поўнага выкарыстання ўсяго комплексу ўмоў месцазнаходжання. Змяняецца ў антагенезе (напр., аднагадовыя сеянцы елкі або дуба яшчэ не маюць формы дрэва), таму пад Ж.ф. класіфікацыйнай адзінкай лічыцца сукупнасць дарослых асобін. Адзін і той жа від раслін у розных умовах можа мець розныя Ж.ф. (дуб, елка, ядловец і інш. ў лясной зоне або лясным поясе гор — высакаствольныя дрэвы, а на паўн. і вышыннай межах арэала — кусты або сланікі). У класіфікацыю можа ўваходзіць група раслін з падобнымі прыстасавальнымі структурамі, не абавязкова звязаных роднасцю (напр., кактусы і некат. малачаі ўтвараюць формы сцябловых сукулентаў). Тэрмін Ж.ф. прапанаваў дацкі батанік І.Э.Вармінг (1884). Пры гэтым ён разумеў форму, у якой вегетатыўнае цела расліны знаходзіцца ў гармоніі з навакольным асяроддзем на працягу ўсяго жыцця, ад насення да адмірання. Найб. пашырана класіфікацыя Ж.ф., прапанаваная дацкім батанікам К.Раўнкіерам (1905, 1907), які вылучае 5 асн. Ж.ф. (гл. *Сістэма Раўнкіера*). Змяненні Ж.ф. выкарыстоўваюцца для работ па *інтрадукцыі* раслін.

ЖЫЦЦЯЗДО́ЛЬНАСЦЬ, 1) здольнасць асобіны і папуляцыі жыць і размнажацца. Вызначаецца плоднасцю, працягласцю перыяду размнажэння і колькасцю асобін, якія дасягнулі палаваспеласці. 2) Здольнасць асобіны выжываць да вызначанага моманту жыццёвага цыкла, напр. да пачатку перыяду размнажэння. 3) Ж. насення, уласцівасць насення захоўваць здольнасць да прарастання. Насенне, якое толькі што сабрана або захоўваецца пры нізкай т-ры, часта не прарастае, хоць і мае здаровы зародак або жыццяздольнае. Гэта выклікаецца перыядам спакою, пасля якога насенне можа даць нармальныя ўсходы.

ЖЫ́ЧКА Хведар Дзмітрыевіч (н. 20.3.1927, пас. Марс Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1959). Служыў на флоце, працаваў у прэсе, у выд-вах «Беларусь» і «Мастацкая літаратура», у 1972—76 гал. рэдактар газ. «Літаратура і мастацтва». Друкуецца з 1947. Паэтызуе рамантыку марской службы, працу, хараство роднай прыроды (зб. «Стой на вахце, сэрца», 1961, «Настой», 1968, «Абрус», 1985, і інш.). У вострасюжэтных апавяданнях і аповесцях для дзяцей раскрывае сталенне характару юнага героя («Каштанавы «Масквіч», 1959, «Піфагоравы штаны», 1961, «Зброю бяруць сыны», 1964, «Дзе растуць бяссмертнікі», 1967, «Букет вяргіняў», 1970, «Дзень будзе ясны», 1981). На бел. мову пераклаў многія творы чэш., польскіх і славацкіх пісьменнікаў, драму Л.Украінкі «Лясная песня», аповесці М.Алейніка «Леся», Б.Ногейла «Паводка» і інш.

Тв.: Абеліск. Мн., 1973; Карэц калодзежнай вады. Мн., 1983; Абдымкі сонца. Мн., 1988; Сонца скача па траве. Мн., 1989.

ЖЫЯ́РДЫ, беспазваночныя, гл. *Лямблії*.

А.Р.Жэбрак.

ЖЭ́БРАК Антон Раманавіч (27.12.1901, в. Збляны Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. — 20.5.1965), бел. генетык і селекцыянер. Акад. АН Беларусі (1940), д-р біял. н., праф. (1936). Засл. дз. нав. Беларусі (1944). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію (1925), ін-т чырв. прафесуры (1929). У 1930—31 стажыраваўся ў ЗША. У 1934—48 заг. кафедры Маскоўскай с.-г. акадэміі. У 1940—47 чл. Прэзідыума АН Беларусі. У сак. 1945 прадстаўнік Беларусі ў рабоце Усеславянскага сабора ў Сафіі, чл. дэлегацыі БССР на канферэнцыі ў Сан-Францыска (ЗША), дзе з інш. ўдзельнікамі 26.6.1945 падпісаў Статут ААН. У 1947 прэзідэнт АН Беларусі. 16.10.1947 зняты з пасады прэзідэнта. Фармальнай падставай для гэтага паслужыла публікацыя Ж. ў амер. штотыднёвіку «Science» («Навука»), у якой ён выказаў крытыку ў адрас антынавуковай тэорыі Т.Дз.Лысенкі. З 1949 заг. кафедры Маскоўскага

фармацэўтычнага ін-та. У 1953—65 кіраваў работамі па эксперым. поліплаідыі ў Ін-це біялогіі, з 1963 у Аддзеле генетыкі і цыталогіі АН Беларусі. Навук. працы па гібрыдызацыі, поліплаідыі і імунітэце раслін, філагеніі і біял. асновах селекцыі пшаніцы і грэчкі. Атрымаў гібрыдныя пладавітыя формы ад скрыжавання шэрагу відаў пшаніцы.

Тв.: Полиплоидные виды пшениц. М., 1957; Курс ботаники. М., 1959.

Літ.: Хотылева Л.В. А.Р.Жебрак // Полиплоидия и селекция. Мн., 1972.

ЖЭГУЛІ́, горы, тое, што *Жыгулі*.

ЖЭ́ЖЛІНА, возера ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ула (цячэ праз возера), за 7 км на ПнУ ад г. Лепель. Пл. 0,36 км^2, даўж. 1,1 км, найб. шыр. 560 м, найб. глыб. 9,8 м, даўж. берагавой лініі каля 3,6 км. Пл. вадазбору 1366 км^2. Схілы катлавіны выш. 10—15 м, участкамі разараныя, на Пд і ПдЗ параслі лесам. Берагі пясчаныя, месцамі забалочаныя, на ПдЗ пад лесам. Дно глеістае. Каля ўсх. берага востраў пл. 0,7 га. Уздоўж берагоў паласа раслінасці шыр. да 100 м.

ЖЭЙМО́ Яніна Баляславаўна (29.5.1909, г. Ваўкавыск Гродзенскай вобл. — 29.12.1987), расійская кінаактрыса. Скончыла кінамайстэрню ФЭКС (Фабрыка эксцэнтрычнага акцёра; 1929), вучылася ў Ін-це экраннага мастацтва ў Ленінградзе. З дзяцінства выступала ў цырку, працавала на эстрадзе (1925—27), у Тэатры-студыі кінаакцёра (1949—56). З 1957 у Варшаве. У кіно з 1925. Першая вялікая роля — Анук («Песня пра шчасце», 1934). Стварыла паэт. вобразы дзяўчынак-падлеткаў: Ася («Сяброўкі», 1936), Надзя («Ворагі», 1938), Фроська («Ішоў салдат з фронту», 1939), Папялушка («Папялушка», 1947). Здымалася таксама ў фільмах: «Адна маладая настаўніца» (1931), «Мая радзіма» (1932), «Гарачыя дзянёчкі» (1935), «Доктар Калюжны» (1939), «Два байцы» (1943), «Мы з Урала» (1944), «Два сябры» (1955) і інш. Мастацтву Ж. ўласцівы глыбокі псіхалагізм, лірычны трагізм у спалучэнні з вострай эксцэнтрыкай, дакладнасць пластычнага малюнка. *Н.А.Крывашэева.*

ЖЭКІТЫНЬЁНЬЯ (Jequitinhonha), рака на У Бразіліі. Даўж. 1030 км, пл. бас. каля 73 тыс. км^2. Пачынаецца на хр. Сера-ду-Эспіньясу, цячэ па Бразільскім пласкагор'і, утварае парогі і вадаспады. Упадае ў Атлантычны ак. Жыўленне дажджавое. Летнія паводкі са снеж. да сакавіка. Сярэдні расход вады каля 550 м^3/с. Суднаходная ў ніжнім цячэнні на 100 км. На Ж. — г. Жэкітыньёнья.

ЖЭЛАЦІ́НА, жэлацін (франц. gélatine ад лац. gelatus замёрзлы, застылы), сумесь бялковых рэчываў жывёльнага паходжання; прадукт дэнатурацыі *калагену*. Сухая Ж. без паху, смаку, празрыстая, злёгку афарбаваная ў жоўты колер. Набухае ў вадзе і раствараецца пры награвanні, раствор пры ахаладжэнні ўтварае студзіну. Атрымліваюць з касцей, сухажылляў, храсткоў (найб. чыстая — з рыбных), адходаў скуры шляхам працяглага кіпячэння з вадой. Выкарыстоўваюць у харч., папяровай, паліграф. прам-сці, у выт-сці фота- і кінаплёнак, фотапаперы, у мікрабіялогіі (пажыўнае асяроддзе).

ЖЭ́ЛЕЎ Жэлю (н. 3.3.1935, с. Весялінава Шуменскай акр., Балгарыя), балгарскі паліт. і дзярж. дзеяч, філосаф. Д-р філас. н. (1987). Скончыў Сафійскі ун-т. З 1960-х г. за ідэйна-паліт. пазіцыі праследаваўся ўладамі, выключаны з Балг. камуніст. партыі. Лідэр Саюза дэмакр. сіл (снеж. 1989 — жн. 1990). У 1990—96 прэзідэнт Балгарыі; праводзіў курс на дэкамунізацыю балг. грамадства. Аўтар прац «Фашызм» (1982, забаронена і канфіскавана з продажу і бібліятэк, зноў выдадзена ў 1990), «Рэальная фізічная прастора» (1989) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Фашизм: Тоталитар. государство. М., 1991.

ЖЭ́ЛЬЦЫ, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Сосніца, за 38 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 0,78 км^2, даўж. 1,9 км, найб. шыр. 720 м, найб. глыб. 2,8 м, даўж. берагавой лініі больш за 5 км. Пл. вадазбору 63,5 км^2. Схілы катлавіны выш. да 7 м (на Пд 15—20 м), пад лесам, на ПнЗ разараныя. Берагі нізкія. Дно плоскае, выслана пераважна пяском і глеямі, у цэнтры — сапрапелем. Зарастае. Упадаюць р. Няклейка і ручай з воз. Сіценец, выцякае р. Жэльцанка.

ЖЭМА́ЙТЭ [Žemaitė; сапр. Беношавічутэ-Жымантэне (Beniušavičiūtė-Žymantienė)] Юлія (4.6.1845, маёнтак Букантэ, Плунгескі р-н, Літва — 7.12.1921), літоўская пісьменніца. Друкавалася з 1894. Асн. тэматыка яе твораў — жыццё літ. вёскі ў канцы 19 — пач. 20 ст. Цяжкі лёс літ. сялянства, бяспраўе жанчыны, самабытнасць вясковага побыту, рэліг. перажыткі памастацку асэнсаваны ў яе апавяданнях і аповесцях «Нявестка» (1896), «Пятрас Курмяліс» (1901), «Няшчасныя дзеці» (1903), «Ахвяра святому Юргісу» (1908) і інш. Яе творы адметныя каларытным апісаннем прыроды, побыту, звычаяў, знешняга аблічча герояў, аб'ектыўнай, з элементамі іроніі і камізму, апавядальніцкай манерай. Аўтар шматлікіх нарысаў, фельетонаў, публіцыст. артыкулаў. На бел. мову асобныя творы Ж. пераклалі А.Клышка, Я.Скрыган.

Тв.: Raštai. Sėj. 1—6. Vilnius, 1956—57.

ЖЭМА́ЙЦКАЕ ЎЗВЫ́ШША, Жмудскае ўзвышша, у зах. ч. Літвы, у бас. рэк Вянта, Юра, Мінія і Дубіса. Выш. да 234 м (г. Мядзвегаліс). Складзена з глін, пяскоў, мергеляў. Характэрны згладжаны марэнна-ўзгоркавы рэльеф. Шмат азёр. Хвойныя і мяшаныя лясы, лугі, пашы, ворная зямля.

ЖЭМ'Е́ (Gémier; сапр. Танер; Tonnerre) Фірмэн (21.2.1869, г. Абервіль, Францыя — 26.11.1933), французскі акцёр, рэжысёр, тэатр. дзеяч. Вучыўся ў прыватнай драм. студыі. Сцэн дзейнасць пачаў у 1888. З 1892 іграў у розных т-рах Парыжа. У 1906—21 узначальваў Тэатр Антуана, у 1920—33 — створаны ім Нац. нар. т-р. Лічыў грамадскім прызначэннем тэатр. мастацтва служэнне народу, шукаў новыя формы тэатр. паказаў, імкнуўся спалучаць тэатральнасць з жыццёвай праўдай. Валодаў віртуозны сцэн. тэхнікай, майстар гриму. З лепшых роляў: Убю («Кароль Убю» А.Жары), Шэйлак («Венецыянскі купец» У.Шэкспіра), Філіп Брыло («Драпежніца» Э.Фабра паводле А.Бальзака). З 1908 здымаўся ў кіно і ставіў фільмы.

ЖЭ́МЧУГ (слова кіт. паходжання), перл, цвёрдыя вапняковыя ўтварэнні перламутравага рэчыва шарападобнай ці няправільнай формы ўнутры ракавін некаторых малюскаў (марскіх і прэснаводных). Складзены пераважна з вугляслага кальцыю (араганіту). Колер бе-

Вышыўка **жэмчугам** адзення мітрапаліта Аляксея. 1364. Фрагмент.

лы, ружовы, жаўтаваты, іншы раз чорны, шэры, карычневы. Бляск характэрны перламутравы, вясёлкавы. Памеры ад мікраскапічных да галубінага яйца. Утвараецца ў выніку раздражнення мантыі малюска якім-н. чужародным целам (пясчынкай, паразітам і інш.). Здабыча марскога Ж. вядзецца ў Чырвоным м., Персідскім зал., каля берагоў Аўстраліі, Японіі і інш. Прэснаводны Ж. здаўна здабывалі ў Кітаі, Расіі, Германіі, Шатландыі. У 20 ст. вельмі пашырана штучнае вырошчванне Ж. (пераважна ў Японіі). Выкарыстоўваецца ў ювелірнай справе (каралі, брошкі, пярсцёнкі, жамчужнае шыццё), нярэдка ў спалучэнні з каштоўнымі металамі і камянямі. *У.Я.Бардон.*

ЖЭНЕ́ВА (франц. Genève, ням. Genf), горад на ПдЗ Швейцарыі, на Жэнеўскім воз. і р. Рона. Адм. ц. кантона Жэ-

нева. 172,7 тыс. ж., з прыгарадамі каля 400 тыс. ж. (1994), каля 25% насельніцтва — іншаземцы. Вузел чыгунак і аўтадарог, азёрны порт. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-фін. цэнтр. Прам-сць базіруецца на выкарыстанні высокакваліфікаванай працы. Вылучаюцца ювелірная справа, дакладная механіка (гадзіннікі, розныя інструменты, дакладная апаратура), станкабудаванне, электратэхн. машынабудаванне, выт-сць рухавікоў, фармацэўтычнай, парфумернай, тэкст., харч. прадукцыі. Ун-т (з 1559). Цэнтр замежнага турызму.

Першапачаткова пасяленне *кельтаў* (*алаброгаў*), умацаванае Цэзарам у 58 да н.э. ў перыяд вайны з гельветамі. З 5 ст. рэзідэнцыя біскупства; у гэты ж час заваявана *бургундамі*, у 534 — *франкамі*. У канцы 9 ст. зноў пад уладай Бургундыі, разам з ёй увайшла ў склад «Свяшчэннай Рым. імперыі». У 1162 біскупы Ж. атрымалі ад імператара *Фрыдрыха I* Барбаросы тытул князёў. З пач. 13 ст. за паліт. вяршэнства ў горадзе вяліся спрэчкі паміж біскупамі Ж. і герцагамі савойскімі. На мяжы 14 і 15 ст. Ж. славілася кірмашамі, пазней стала значным цэнтрам крэдытна-банкаўскіх аперацый. У 16 ст. ў ходзе барацьбы з герцагамі савойскімі прымкнула да Швейцарскай канфедэрацыі. З 1539 гал. цэнтр Рэфармацыі (Г.Фарэль, Ж.*Кальвін*) еўрап. значэння (наз. «пратэстанцкім Рымам»). Створаная ў 16 ст. алігархічная форма праўлення выклікала шэраг паўстанняў. У 18 ст. развіваецца прам-сць (пераважна выт-сць гадзіннікаў). У 1798—1814 пад уладай Францыі, у 1815 як кантон увайшла ў Швейцарскую канфедэрацыю. З 2-й пал. 19 ст. месца склікання міжнар. канферэнцый і знаходжання міжнар. арг-цый, у т.л. гал. органаў Лігі Нацый, пасля 2-й сусв. вайны — розных устаноў ААН.

Рака Рона падзяляе Ж. на 2 часткі. На левым беразе — Стары горад (гіст. цэнтр), дзе размешчаны ун-т, т-ры, б-кі, Саборная пл. з раманска-гатычным саборам Сен-П'ер (12—14 ст.; фасад у стылі класіцызму, 1752—56), гатычныя цэрквы Сент-Мары-Мадлен (14—15 ст.), Сен-Жэрмен (14—16 ст.), ратуша (15 ст. — 1617), гатычныя, рэнесансавыя і класіцыстычныя жылыя дамы, палац Энар (1817—21). На правым беразе — Новы горад (са старым кварталам і царквой Сен-Жэрве, 15 ст.): вакзал Карнавен (1928), дом «Клартэ» (1930—32, арх. Ле Карбюзье), Палац Нацый (1928—37, арх. Гіёль), будынак Суса. арг-цыі аховы здароўя (1961, арх. Ж.Чумі). Музеі: мастацтва і гісторыі, сучаснага мастацтва, этнаграфіі. *Н.К.Мазоўка* (гісторыя).

ЖЭНЕЎСКАЕ ВО́ЗЕРА (ням. Genfer See, франц. Lac Léman), Л е м а н, возера ў Швейцарыі і Францыі, у міжгорнай упадзіне паміж Зах. Альпамі і Юрой, на выш. 372 м. Пл. 582 км^2, даўж. 72 км, шыр. 14 км, глыб. да 310 м. Берагі стромкія. На З да Ж.в. падыходзяць узгорыстыя перадгор'і, на У — скалістыя горы. Па паходжанні Ж.в. — канцавы басейн аднаго з рукавоў вял. Ронскага ледавіка. Цераз возера цячэ р. Рона. Сцёк рэгулюецца плацінай. На швейцарскім беразе гарады Жэнева, Лазана, курорты Веве, Мантро, рэзерват Гранжэт; на франц. — курорт Эвіянле-Бэн і інш. Суднаходства. Турызм.

ЖЭНЕЎСКАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ 1927, канферэнцыя міністраў замежных спраў Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Францыі і Японіі. Праходзіла 14—16 чэрв. ў час сесіі Савета *Лігі Нацый*, склікана пасля разрыву англ.-сав. дыпламат. і гандл. пагадненняў (май 1927). Міністр замежных спраў Вялікабрытаніі О.Чэмберлен прапанаваў прыняць дэкларацыю «супраць прапаганды Камінтэрна», якая магла б стаць платформай адзінага антысав. фронту. Удзельнікі Ж.к. не падтрымалі Чэмберлена і прынялі камюніке, дзе абавязваліся прытрымлівацца ўмоў *Лакарнскіх дагавораў 1925* аб непарушнасці герм.-франц. і герм.-бельг. граніц, вызначаных *Версальскім мірным дагаворам 1919*.

ЖЭНЕЎСКАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ ПА РАЗЗБРАЕ́ННІ 1932—35, міжнародная канферэнцыя аб скарачэнні і абмежаванні ўзбраення. Склікана 2.2.1932 па рашэнні Савета *Лігі Нацый*, удзельнічалі 63 краіны. Некаторыя краіны імкнуліся выкарыстаць канферэнцыю для аслаблення магчымых праціўнікаў і ўзмацнення сваёй ваен. магутнасці (франц. дэлегацыя дамагалася захавання ваен. перавагі над Германіяй паводле *Версальскага мірнага дагавора 1919*, герм. дэлегацыя патрабавала роўнасці ва ўзбраеннях, а ў кастр. 1933 адмовілася ад удзелу ў канферэнцыі). Дэлегацыя СССР прапанавала пакласці ў аснову работы прынцыпы ўсеагульнага і поўнага раззбраення, а пасля адхілення гэтай прапановы — правесці прагрэс.-прапарцыянальнае скарачэнне ўзбраенняў і ўзбр. сіл. Сав. прапановы былі адхілены, канферэнцыя зайшла ў тупік і ў 1935 фактычна спыніла сваю работу.

ЖЭНЕЎСКАЯ НАРА́ДА ПА ЎРЭГУЛЯВА́ННІ ЛАО́СКАГА ПЫТА́ННЯ. Склікана па ініцыятыве СССР, праходзіла з 16.5.1961 да 23.7.1962. Прадстаўнікі Бірмы, Вялікабрытаніі, ДРВ, ЗША, Індыі, Камбоджы, Канады, КНР, Лаоса, Польшчы, СССР, Тайланда, Францыі і Паўд. В'етнама прынялі Дэкларацыю і Пратакол аб нейтралітэце Лаоса, заявілі, што будуць паважаць яго суверэнітэт, незалежнасць, нейтралітэт, адзінства і тэр. цэласнасць. Пагадненні прадугледжвалі стварэнне ў Лаосе каліцыйнага ўрада (сфарміраваны ў чэрв. 1962). Аднак рэалізаваць дамоўленасці і дасягнуць нац. адзінства ў Лаосе не ўдалося. У 1964 ЗША парушылі ўмовы пагаднення, пачалі бамбардзіроўкі тэр. Лаоса.

ЖЭНЕЎСКАЯ ШКО́ЛА ў м о в а з н а ў с т в е, гл. ў арт. *Структурная лінгвістыка*.

ЖЭНЕЎСКІЯ КАНВЕ́НЦЫІ 1949, чатыры міжнародныя пагадненні аб абароне ахвяр вайны: аб паляпшэнні лёсу параненых і хворых у дзеючых арміях; аб паляпшэнні лёсу параненых, хворых і асоб са складу ўзбр. сіл, якія пацярпелі караблекрушэнне на моры; аб абыходжанні з ваеннапалоннымі; аб абароне цывільнага насельніцтва ў час вайны. У 1977 канвенцыі дапоўнены 2 дадатковымі пратаколамі — аб абароне ахвяр міжнар. узбр. канфліктаў і аб абароне ахвяр узбр. канфліктаў неміжнар. характару. Да Ж.к. далучылася 170 краін, у т.л. Беларусь (1954).

ЖЭНЕЎСКІЯ НАРА́ДЫ 1954—59. 1) Нарада 26.4—21.7.1954 міністраў замежных спраў Вялікабрытаніі, ЗША, КНР, СССР і Францыі. Разглядала пытанні мірнага ўрэгулявання ў Карэі і Індакітаі. План аднаўлення адзінства Карэі прадугледжваў правядзенне свабодных агульнакар. выбараў у Нац. сход, вывад з краіны замежных войск. ЗША і іх саюзнікі адмовіліся прыняць план, і пытанне аб Карэі не было ўрэгулявана. 20 ліп. падпісана пагадненне пра спыненне ваен. дзеянняў у В'етнаме, устанаўленне часовай дэмаркацыйнай лініі па 17-й паралелі і тэрмінах адводу ад яе войск краін, якія ваявалі, аб вывадзе з тэр. Лаоса і Камбоджы франц. войск. На тэр. В'етнама, Лаоса, Камбоджы забаранялася ствараць ваен. базы, а дзяржавам уваходзіць у ваен. саюзы. У 1955 адбыліся выбары ў Камбоджы, у 1958 — у Лаосе, выбары ў В'етнаме ў 1956 сарвалі ЗША, якія ў 1961 пачалі вайну супраць народаў Індакітая. 2) Нарада 18—23.7.1955 кіраўнікоў урадаў Вялікабрытаніі, ЗША, СССР і Францыі. Абмеркаваны герм. пытанне, пытанне аб еўрап. бяспецы, аб развіцці кантактаў паміж Усходам і Захадам. Зах. дзяржавы выступілі за аб'яднанне Германіі шляхам ліквідацыі ГДР і ўключэння аб'яднанай краіны ў ваен.-паліт. групоўку зах. дзяржаў. СССР выступіў супраць, падкрэсліўшы, што на тэр. Германіі існуюць 2 самаст. дзяржавы з розным грамадскім і дзярж. ладам. Сав. прапанова аб узяцці СССР, ЗША, Вялікабрытаніяй і Францыяй на сябе абавязку не ўжываць першымі ядз. зброю была адхілена. 3) Нарада 27.10—16.11.1955 міністраў замежных спраў Вялікабрытаніі, ЗША, СССР і Францыі. Сав. дэлегацыя адхіліла план зах. дзяржаў аб аб'яднанні Германіі і скасаванні ГДР, унесла прапановы па еўрап. бяспецы і раззбраенні (паступовае скарачэнне ўзбр. сіл да ўзгодненых узроўняў, забарона выкарыстання ядз. зброі і інш.). Рашэнні па пытаннях раззбраення і кантактах паміж Усходам і Захадам прыняты не былі. 4) Нарада 11.5—20.6.1959 і 13.7—5.8.1959 міністраў замежных спраў Вялікабрытаніі, ЗША, СССР і Францыі. Абмеркаваны герм. пытанне, стварэнне сістэмы еўрап. бяспекі і кантролю над раззбраеннем, развіццё кантактаў паміж Усходам і Захадам. ЗША, Вялікабрытанія і Францыя адмовіліся прыняць сав. прапанову аб стварэнні дэмілітарызаванага вольнага горада — Зах. Берлін, але дасягнута дамоўленасць аб часовым статусе Зах. Берліна (агаворвалася колькасць узбр. сіл з дзяржаў, неразмяшчэнне на яго тэр. атамнай і ракетнай зброі, парадак доступу ў Зах. Берлін і інш.).

Л.М.Драбовіч.

ЖЭНЕЎСКІЯ ПАГАДНЕ́ННІ 1988 п а А ф г а н і с т а н е. Падпісаны 14 крас.

прадстаўнікамі Афганістана, ЗША, Пакістана, СССР як вынік афгана-пакістанскіх перагавораў, якія праходзілі ў Жэневе з чэрв. 1982 (з перапынкамі) пры пасрэдніцтве прадстаўніка Ген. сакратара ААН. Мелі на мэце спыніць *грамадзянскую вайну ў Афганістане.* Складаліся з Двухбаковага пагаднення паміж Рэспублікай Афганістан і Ісламскай Рэспублікай Пакістан аб прынцыпах узаемаадносін (у т.л. аб неўмяшанні і адмове ад інтэрвенцыі), Двухбаковага пагаднення паміж гэтымі краінамі пра добраахвотнае вяртанне бежанцаў, Дэкларацыі аб міжнар. гарантыях і Пагаднення аб узаемасувязі для ўрэгулявання становішча, якое датычыцца Афганістана. Апошняе пагадненне адной з гал. умоў прадугледжвала вывад з Афганістана сав. войск (паловы да 15.8.1988, астатніх на працягу 9 месяцаў). Няпоўнае выкананне пагадненняў Пакістанам (на яго тэр. працягвалі базіраваща ўзбр. фарміраванні для вядзення баёў на тэр. Афганістана) у значнай ступені перашкодзіла спыненню грамадз. вайны ў Афганістане. *У.Я.Калаткоў.*

ЖЭНЕЎСКІЯ ПРАТАКО́ЛЫ, 3 міжнародныя дакументы, прынятыя ў г. Жэнева ў 1922—25. 1) Пратакол 1922 аб пазыцы для Аўстрыі і аб забароне *аншлюсу.* Падпісалі Аўстрыя, Вялікабрытанія, Францыя, Італія, Чэхаславакія. Палажэнні пратакола дзейнічалі да акупацыі Аўстрыі фаш. Германіяй (1938). 2) Пратакол 1924 аб мірным вырашэнні міжнар. спрэчак. Прыняты Асамблеяй Лігі Нацый. Падпісалі 19 краін, аднак дакумент не набыў сілы, бо Англія і Італія адмовіліся падпісваць яго. 3) Пратакол 1925 аб забароне ўжывання на вайне ўдушлівых, ядавітых або інш. падобных газаў і бактэрыял. сродкаў. Падпісалі 37 краін.

ЖЭ́ННА, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Тураўлянка, за 28 км на У ад г.п. Ушачы. Уваходзіць ва *Ушацкую групу азёр.* Пл. 0,57 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 25 м, даўж. берагавой лініі 3,7 км. Пл. вадазбору 10,9 км^2. Схілы катлавіны выш. 15—25 м (на Пн і У 5—8 м), пад лесам і хмызняком. Мелкаводдзе вузкае, дно да глыб. 6—8 м пясчанае, ніжэй глістае. На ПдУ упадае ручай з воз. Лешна, на ПдЗ выцякае ручай у воз. Крывое. Уздоўж берагоў паласа надводнай расліннасці шыр. да 20 м.

«ЖЭНЬМІ́НЬ ЖЫБА́О» («Народная газета»), штодзённая газета; орган ЦК КП Кітая. Выдаецца з 1948 у Пекіне. Выконвае функцыі афіц. ўрадавага выдання.

ЖЭНЬШЭ́НЬ (Panax ginseng; кіт. «корань жыцця» літар. «чалавек-корань»), рэліктавая кветкавая расліна роду панакс сям. араліевых. Трапляецца ў цяністых шыракаліста-хвойных лясах Паўн.-Усх. Кітая, Паўн. Карэі і на Д. Усходзе (Прыморскі і Хабараўскі краі). Занесены ў Чырвоную кнігу СССР (1984). На Беларусі вырошчваецца ў культуры ў некат. гаспадарках і аматарамі.

Шматгадовая травяністая расліна з адзіночным прамастойным сцяблом выш. каля 0,5 м і кальчаком з 3—5 доўгачаранковых пальчата-складаных лістоў у яго верхняй частцы. Корань масай да 400 г стрыжнёвы, слабагалінасты, мясісты, белавата-шэры або жаўтаваты, расце марудна (да 100 і больш гадоў). Кветкі дробныя, зеленавата-белыя, сабраныя ў просты парасонік. Плод — ярка-чырвоная сакаўная касцянка. Вільгацелюбівая, адносна цеплалюбівая расліна, размнажаецца насеннем. Каштоўная лек. расліна (мае ў каранях і карэнішчы трытэрпенавыя кліказіды з танізуючым дзеяннем). Прэпараты Ж. выкарыстоўваюць пры сардэчных і нерв. захворваннях, малакроўі, гіпатаніі, рэўматызме, цукр. дыябеце і інш. *Г.У.Вынаеў.*

Жэньшэнь.

ЖЭО́ДА (франц. gëode ад грэч. geōdēs зямляны), замкнутая поласць у горнай пародзе, не цалкам запоўненая скрытакрышт. або яўнакрышт. агрэгатамі мінералаў. Форма Ж. ізаметрычная, акруглая і інш. Часта мінер. рэчыва ў Ж. ўтварае канцэнтрычныя занальныя слаі (напр., агаты). Іншы раз унутры Ж. пустата, сценкі якой звычайна ўкрыты друзамі крышталёў.

ЖЭ́РА (Żera) Караль Антоні (1.9.1743, в. Тварогі Выпыхі, Бельскае ваяв., Польшча — пасля 1798), польскі пісьменнік. Адукацыю атрымаў у Драгічыне над Бугам (Польшча), потым у Пінску, дзе ў 1765 прыняў духоўны сан. Доўгі час жыў у Сянно. Аўтар зборніка бел., польскіх і лац. фацэцый (анекдотаў) «Безліч рэчаў, торба смеху, гарох з капустай, а кожны сабака з другой вёскі...» (распаўсюджваўся ў рукапісах). Многія анекдоты, пераважна антыпрыгонніцкага і антыклерыкальнага зместу, запісаны на Беларусі і бел. мове. Па розных копіях зборнік Ж. выдадзены З.Глогерам у Варшаве (1893). *А.В.Мальдзіс.*

ЖЭРА́Р (Gérard) Франсуа Паскаль Сімон (4.5.1770, Рым — 11.1.1837), французскі жывапісец і літограф, прадстаўнік *рамантызму.* Каля 1782—83 вучыўся ў парыжскім «Каралеўскім пансіёне», у 1786—89 вучань Ж.Л.*Давіда.* Быў адным з афіц. партрэтыстаў Напалеона, потым Бурбонаў. Сярод твораў: партрэты Ж.Б.Ізабэ з дачкой (1795), Напалеона I у каранацыйным адзенні, імператрыцы Жазефіны (1801), мадам Рэкам'е (1802), мадам Талейран (1805), В.П.Качубея (1809) і інш., карціны «Псіхея і Амур» (1797), «Бітва пры Аўстэрліцы» (1810), «Уваход Генрыха IV у Парыж» (1817), «Каранаванне Карла X» (1829); дэкар. размалёўкі ў парыжскім Пантэоне (1810-я г.). Па малюнках Ж. гравіраваны ілюстрацыі да твораў Вергілія, Ж.Расіна і інш.

Ф.Жэрар. Партрэт В.П.Качубея. 1809.

ЖЭ́РАХ (Aspius aspius), рыба сям. карпавых. Пашыраны ў бас. Паўночнага, Балтыйскага, Чорнага, Каспійскага і Аральскага мораў. Жыве на раўнінных ч. рэк, радзей у праточных азёрах. Трымаецца адзін, у невял. чародкі збіраецца ў час нерасту і ўвосень. На Беларусі трапляецца ва ўсх. вял. і сярэдніх рэках, некат. праточных азёрах. Нар. назвы: шэрах, бялізна, бялюга, беляспер, дзяляпер, шэраспер, жэраспер, жэрасель, жэрасць, белясць.

Даўж. цела да 80 см, маса да 12 кг. Цела светлае, серабрыстае, прадаўгаватае, пляскатае. Спінны і хваставы плаўнікі шэрыя з цёмнымі канцамі, астатнія чырванаватыя. Палаваспелы ў 4—5 гадоў. Маляўкі кормяцца ракападобнымі, доннымі беспазваночнымі; дарослы — драпежнік: корміцца рыбай і інш. дробнымі жывёламі. Аб'ект рыбалоўства.

Жэрах.

ЖЭРМІНА́ЛЬСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1795, гл. ў арт. *Французская рэвалюцыя 1789—99.*

ЖЭРЫКО́ (Géricault) Жан Луі Андрэ Тэадор (26.9.1791, г. Руан, Францыя — 26.1.1824), французскі жывапісец і графік, заснавальнік *рамантызму*. Вучыўся ў К.*Вернэ* і П.Герэна. Зазнаў уплывы Ж.Л.*Давіда* і А.*Гро*. Быў у Італіі (1816—17), Англіі (1820—22), Бельгіі (1820). Працаваў у Парыжы. Раннія творы вылучаюцца эмацыянальнасцю вобразаў і дынамічнасцю («Афіцэр конных егераў імператарскай гвардыі ідзе ў атаку», 1812, «Паранены кірасір пакідае поле

Т.Жэрыко. Афіцэр конных егераў імператарскай гвардыі ідзе ў атаку. 1812.

бою», 1814). Пасля паездкі ў Італію ўзмацняецца абагульненая манументальнасць форм, каларыт амаль манахромны («Бег вольных коней у Рыме», 1817, «Плыт Медузы», 1818—19). У шэрагу партрэтаў выказаў рамант. ўяўленне пра мастака як пра свабодную, незалежную асобу; серыя «Партрэты звар'яцелых» (1819—20) прасякнута гуманізмам. Адзін з першых стаў працаваць у тэхніцы *літаграфіі* (серыя «Вялікія і малыя англійскія сюіты», 1820—21). Стварыў кампазіцыі са сцэнамі нар. жыцця, некалькі скульпт. работ.

Літ.: Жерико о себе и современники о нем: Пер. с фр. М., 1962; Прокофьев В.Н. Теодор Жерико. М., 1963; Турчин В.С. Теодор Жерико. М., 1982.

ЖЭ́РЫНСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Усвейка, за 9 км на У ад г. Чашнікі. Пл. 8,74 км², даўж. 6,6 км, найб. шыр. 1,7 км, найб. глыб. 3,6 м, даўж. берагавой лініі 14,8 км. Пл. вадазбору 45,8 км². Схілы катлавіны выш. да 2 м (на ПдУ і З да 10 м), пераважна пад лесам і хмызняком. Берагі сплавінныя, на З пясчаныя, параслі хмызняком. Дно сапрапелістае, уздоўж зах. берага пясчанае. У паўд. частцы востраў пл. 14 га. Зарастае. Упадаюць 6 ручаёў, вышэйшае ручай у р. Усвейка.

ЖЭ́СТАЎ МО́ВА, камунікатыўная сістэма на кінетычнай (жэстыкуляторна-мімічнай) аснове; асн. сродак зносін глухіх. Мінімальная адзінка Ж.м. — жэст — складаецца з херэм (ад грэч. hejr, hejrōs рука), якія паказваюць на месца, канфігурацыю і характар жэста. Колькасць херэм параўнальная з колькасцю *фанем* гукавой мовы. Ж.м. ўключае таксама позірк, выраз твару, рухі галавы і цела, функцыі якіх больш шырокія, чым у гукавых мовах. Структурна і катэгарыяльна такія Ж.м. не залежаць ад гукавых моў, іх роднасныя сувязі не вызначаюцца адпаведнымі нац. мовамі (напр., амслен, Ж.м. глухіх ЗША і большай часткі Канады, блізкі да мовы глухіх Францыі, аднак не роднасны мове глухіх Англіі).

Ж.м. называюць таксама жэставыя манифестацыі гукавых моў. У развітых грамадствах большая частка глухіх двухмоўная (валодаюць роднай Ж.м. і нац. мовай). У час зносін на агульнанац. мове выкарыстоўваюць яе жэставы варыянт: захоўваецца сінтакс. структура, рэдуцыруецца марфалогія, словы замяняюцца жэстамі; безаналагавыя элементы гукавой мовы дактыліруюцца (палітарна перадаюцца пальцавай азбукай). *А.М.Рудэнка.*

ЖЭТО́Н (франц. jeton), 1) металічны значок, які паказвае на прыналежнасць да якой-н. арганізацыі ці т-ва або выдаецца на памяць аб якой-н. падзеі. 2) Метал. кружок, які замяняе манету (напр., у гандл. аўтаматах) або дае права на атрыманне чаго-н. 3) Метал. значок з *асабістым нумарам* афіцэра.

ЖЭХЭ́, нагор'е на ПнУ Кітая, гл. *Ляасі.*

ЖЭ́ШАЎ (Rzeszów), горад на ПдУ Польшчы, на р. Віслак. Адм. ц. Жэшаўскага ваяв. 159 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд. (вытв-сць авіяц. рухавікоў, эл.-тэхн. абсталявання, прыладабудаванне), харчовая (мясакамбінат, плодакансервавыя з-ды). З-д тэхн. фарфору. Політэхн. ін-т, Вышэйшая пед. школа. Тэатры, філармонія. Музей, маст. галерэя.

У 11—12 ст. пасяленне, пазней памежны горад Сандамірскай зямлі. У пач. 14 ст. за-

Жэрынскае возера.

хоплены галіцкімі князямі, зноў уключаны ў склад Польшчы *Казімірам III* Вялікім. Гар. правы з 1354. Дасягнуў росквіту ў канцы 16 — 1-й пал. 17 ст., важны гандл.-рамесны цэнтр на шляху з Кракава ў Расію (адбываліся кірмашы). У 17—19 ст. у Ж. існаваў калегіум піяраў. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай у складзе Аўстрыі (1772—1918). У 2-ю сусв. вайну пад ням.-фаш. акупацыяй.

Захаваліся арх. помнікі: парафіяльны касцёл (1-я пал. 15 ст., у стылі готыкі, перабудаваны ў 1754 у стылі барока); кляштар бернардзінцаў з касцёлам у стылі маньерызму (1624—29; кляштар перабудаваны ў 19 і 20 ст.); кляштар піяраў (1624—29; дабудаваны ў 1702—07, арх. Тыльман Гамерскі) з барочным касцёлам (1642—49); калегіум (1703—04, арх. Тыльман Гамерскі; перабудаваны ў 1835 і ў 2-й пал. 19 ст.); сінагогі Старога горада (17 ст.) і Новага горада (1705—10; адноўлена ў 1954—63); стараж. замак з барочнай вежай колішняга палаца (1620); бастыённыя фартыфікацыі (1-я пал. 17 ст.); палац Любамірскіх (пач. 18 ст., арх. Тыльман Гамерскі (?); перабудаваны ў 18 ст., арх. Т.Белоцы, і ў 20 ст.).

ЖЭ́ШАЎСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Rzeszowskie), на ПдУ Польшчы. Пл. 3397 км², нас. 740 тыс. чал., гарадскога каля 42% (1993). Адм. ц. — г. *Жэшаў*. Найб. гарады: Мелец, Ланцут, Лежайск. Размешчана ў міжрэччы Вісłы і Сана на Кальбушоўскім пласкагор'і і перадгор'ях Карпат. Клімат умераны. Сярэдняя т-ра студз. -3 °С, ліп. 19 °С, ападкаў 700 мм за год. Гал. рэкі — Віслока (прыток Віслы) і Віслак (прыток Сана). Глебы на Пн малаўрадлівыя, падзолістыя, у цэнтр. ч. ўрадлівыя, утвораныя на лёсах, на Пд — горныя. Пад лесам 24% тэрыторыі. Гаспадарка прамысл.-аграрная. Прам-сць: трансп. сродкаў (авіяц., аўтамаб.), машынабудаванне (авіяц. рухавікі, станкі), металаапрацоўка (прадметы хатняй гаспадаркі, вырабы з серабра), харчасмакавая (кансервавая, піваварная, тытунёвая, цукр.), мэблевая, хім., буд. матэрыялаў. Здабыча прыроднага газу. Вырошчваюць пшаніцу, жыта, сланечнік, бульбу, кармавыя культуры, авёс. Гадуюць буйн. раг. жывёлу (малочнага кірунку), коней, птушак.

З

З, дзевятая літара бел. і некаторых інш. слав. алфавітаў. Паходзіць з кірыліцкай Z («зямля»), утворанай на аснове грэкавізант. устаўной Ζ («дзэта»). У старабел. пісьменстве абазначала гукі «з» і «з'» («законъ», «возити»). Мела таксама лічбавае значэнне «сем». У 16 ст. акрамя рукапіснай набыла друкаваную форму Паралельна з ёй, хоць і больш абмежавана, для абазначэння гукаў «з» і «з'» выкарыстоўвалася літара S («зяло»), што ўзнікла шляхам відазмянення грэка-візант. S («дыгама»). У сучаснай бел. мове абазначае шумныя звонкія шчылінныя пярэднеязычныя зычныя гукі «з» і «з'» («зара», «зіма»), а перад глухімі зычнымі ці на канцы слоў — парныя да іх па звонкасці і глухасці гукі «с», «с'» («казка» — «каска», «лезці» — «л'эс'ц'і», «мазь» — «мас'», «полаз» — «полас'»). Уваходзіць у склад дыграфа «дз» («нэндза», «радзіма»). *А.М.Булыка.*

«ЗА ПРАЎДУ», газета. Выдавалася 24.2—29.6.1944 у Навагрудку на бел. мове пры падтрымцы і пад кантролем герм. улад у перыяд акупацыі Беларусі ням.-фаш. захопнікамі. Змяшчала інфармацыю пра падзеі на франтах 2-й сусв. вайны, распараджэнні акупац. улад, пастановы Бел. цэнтр. рады, прамовы лідэраў бел. арг-цый, пісала пра дзейнасць Бел. нар. самапомачы, Саюза бел. моладзі, барацьбу супраць партызан. Сярод публікацый — нарысы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі, паэт. і празаічныя творы А.Каханоўскай, Т.Лебяды, А.Чэмера, Я.Шыпшыны і інш. Выйшла 37 нумароў. *С.У.Жумар.*

«ЗА САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ», франтавая газета. Выдавалася з 11.7.1941 да кастр. 1942 на бел. мове палітупраўленнем Зах. фронту пры ўдзеле ЦК КП(б)Б. Рэдактар М.Ц.Лынькоў. Была разлічана на бел. партызан і жыхароў акупіраванай тэрыторыі рэспублікі. Друкавала найб. важныя дакументы партыі і ўрада, звесткі пра падзеі на франтах, матэрыялы пра мужнасць бел. партызан, працоўны гераізм народа ў тыле ворага. На стар. газеты змешчаны творы Я.Купалы, Я.Коласа (арт. «Роднаму народу», вершы «Байцам-камсамольцам», «Смерць разбойнікам», «Абаронцам роднай зямлі»), П.Броўкі, П.Глебкі, К.Крапівы, М.Лынькова, П.Панчанкі, М.Танка, К.Чорнага, а таксама вершы «Камсамолка-партызанка» Дз.Беднага і «Дзед Талаш» А.Суркова. Інфармавала пра 1-ы Усеславянскі мітынг у Маскве (жн. 1941) і выступленне на ім Я.Купалы. *М.Ф.Шумейка.*

«ЗА СВАБО́ДНУЮ БЕЛАРУ́СЬ», франтавая газета. Выдавалася з 18 сак. да ліст. 1942 на бел. мове палітупраўленнем Калінінскага фронту пры ўдзеле ЦК КП(б)Б. Рэдактар І.Д.Гурскі. Была разлічана на жыхароў акупіраванай тэр. рэспублікі і бел. партызан. Інфармавала пра падзеі на франтах і ў сав. тыле, пра партыз. барацьбу, злачынствы ворага. Змяшчала артыкулы пра герояў вайны, творы Я.Коласа, П.Броўкі, П.Глебкі, К.Губарэвіча, К.Крапівы, П.Панчанкі, М.Танка, а таксама рус. пісьменнікаў У.Вішнеўскага, А.Суркова, М.Ціханава, І.Эрэнбурга і інш. Друкавала паведамленні пра дзейнасць навук. установ і творчых аб'яднанняў Беларусі ў сав. тыле. Выдавала сатыр. лісток *«Партызанская дубінка»*. *М.Ф.Шумейка.*

ЗАА..., з о а ... (ад грэч. zōon жывёла, жывая істота), першая састаўная частка складаных слоў, што абазначае: які адносіцца да жывёл, жывёльнага свету, напр., *заалогія*, *зоагеаграфія*.

ЗААБЕ́НТАС (ад *заа...* + *бентас*), сукупнасць донных жывёл, што жывуць на грунце і ў грунце марскіх і мацерыковых вадаёмаў. Адрозніваюць жывёл, якія жывуць у тоўшчы грунту (*інфауна*), перамяшчаюцца на паверхні грунту (*анфауна*) — многашчацінкавыя чэрві і малюскі, большасць ігласкурых, ракападобныя; прымацоўваюцца да субстрату (*эпіфауна*), плаваюць паблізу дна і толькі перыядычна апускаюцца на дно (нектабентас) — крэветкі, мізіды, некат. галатурыі, прыдонныя рыбы і інш. Асн. маса З. жыве на мелкаводдзі, дасягае многіх дзесяткаў кілаграмаў на 1 м^2 (пераважна малюскі), на большай глыбіні — паліхеты, ракападобныя, ігласкурыя. Гл. таксама *Бентас*.

ЗААЗЕ́Р'Е, гл. *Палескае возера*.

ЗААЗЕ́Р'Е, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна, за 10 км на Пд ад г. Полацк. Пл. 0,45 км^2, даўж. 1,8 км, найб. шыр. 350 м, даўж. берагавой лініі больш за 4 км. Пл. вадазбору 8 км^2. Схілы катлавіны выш. 3—5 м, пераважна пад хмызняком, месцамі на Пн і Пд разараныя. Злучана ручаём з воз. без назвы, на ПнУ выцякае ручай у р. Сомніца.

ЗААЗЕ́Р'Е, вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., на р. Зеха, каля воз. Ворань, на аўтадарозе Лепель—Ушачы. Цэнтр сельсавета. За 14 км на Пн ад горада і чыг. ст. Лепель, 129 км ад Віцебска. 100 ж., 39 двароў (1997). Пачатковая школа, клуб, б-ка.

ЗААЗЕ́Р'Е, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Полацк—Мінск. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 15 км на Пд ад горада і чыг. ст. Полацк, 120 км ад Віцебска. 415 ж., 161 двор (1997). Дрэваапр. цэх. Базавая школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ЗААЗЕ́Р'Е, гідралагічны заказнік на тэр. Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл. Створаны ў 1968 як заказнік рэсп. значэння для захавання ў натуральным стане балотнага масіву з тыповай для міжрэчча стратыграфіяй тарфянікаў. Пл. 4286 га (1997). Размешчаны на Цэнтральнабярэзінскай раўніне і займае ч. Друць-Бярэзінскага міжрэчча. Размешчаны на вярховым балоце. У цэнтры пераважаюць хваёва-кусцікавыя раслінныя асацыяцыі, у паўн. ч. — градавабагнавыя комплексы расліннасці. На ўскраінах пашыраны хваёва-бярозава-пушыцава-сфагнавыя асацыяцыі. На мінер. участках пераважаюць бярозава-асінавыя лясы. У флоры заказніка каля 100 відаў раслін, у т.л. ахоўныя чубатка пустая і зубніца клубняносная.

ЗААЗЕ́РСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл., у бас. р. Клява, за 16 км на ПнЗ ад г.п. Бялынічы. Пл. 0,58 км^2, даўж. 1 км, найб. шыр. 750 м, даўж. берагавой лініі 2,9 км. Пл. вадазбору 8,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 4—6 м, пераважна разараныя, на Пн і

Пд парослыя хмызняком. Берагі нізкія, часткова забалочаныя, пад хмызняком.

ЗААЗЁРЦЫ, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Авута, за 42 км на ПдУ ад г. Міёры. Пл. 0,28 км^2, даўж. больш за 1 км, найб. шыр. 450 м, даўж. берагавой лініі 2,5 км. Пл. вадазбору 4,5 км^2. Схілы катлавіны выш. да 8 м (на З і Пд да 13 м), пераважна разараныя. Востраў пл. 0,5 га.

ЗААЗЁРНАЕ, радовішча даўсанітавых руд у Ельскім і Мазырскім р-нах Гомельскай вобл., за 8 км на Пн ад г. Ельск. 2 рудныя паклады прымеркаваны да тоўшчы каалінітавых глін ніжняга карбону. Руды светла- і буравата-шэрыя, бурыя, складаюцца з каалініту, гібсіту, даўсаніту, бяліту; змяшчаюць кварц, кальцый, сідэрыт, гідраслюды. Прагнозныя запасы каля 80—120 млн. т. Залягаюць на глыб. 415—900 м. Магутнасць карыснай тоўшчы 0,5—6 м. Сыравіна для вытв-сці глініземy (вокіс алюмінію) і кальцыніраванай соды.

А.П.Шчураў.

ЗААЛАГІ́ЧНЫ МУЗЕ́Й, навуковая і культурна-асветная ўстанова, у якой сабраны калекцыі жывёл (у фіксавальных вадкасцях, высушаныя ці даскапала прэпараваныя жывёлы, іх чучалы, шкілеты, скуры, а таксама вырабы з рогу, косці, ракавін і інш.). Калекцыі З.м. складаюцца з навук. фондаў і экспанаваных матэрыялаў. Асн. задачы З.м.: навук. даследаванні па сістэматыцы, фауністыцы, зоагеаграфіі, зменлівасці, параўн. марфалогіі і анатоміі жывёл, тэорыі эвалюцыі; культ.-асв. работа па заалогіі, папулярызацыя справы аховы прыроды; вучэбная работа са школьнікамі і студэнтамі, кансультацыі па пытаннях у галіне паляўнічай, сельскай, лясной гаспадаркі і мед. заалогіі.

Па калекцыях 1-е месца ў свеце належыць Брытанскаму музею ў Лондане, 2-е — С.-Пецярбургскаму (створаны на базе пятроўскай *Кунсткамеры* ў 1832). Існуюць З.м. ў Нью-Йорку, Вашынгтоне, Чыкага, Парыжы, Берліне, Вене, Празе, Капенгагене, Стакгольме, Калькуце, Пекіне, Рыме, Мюнхене, Маскве, Кіеве, Тбілісі, Ерэване, Ашгабаце, Ташкенце, Алматы і інш.

На Беларусі першы Віцебскі губ. вет.-заал. музей засн. ў 1918; у 1921 на базе энтамалагічнай калекцыі В.А.Плюшчэўскага-Плюшчыка пры Віцебскім с.-г. тэхнікуме створаны З.м. (з 1924 прыродазнаўча-гіст. музей Віцебскага вет. ін-та). З.м. існуюць у БДУ (1923), Гомельскім ун-це (1981). У 1992 пры музеі БДУ створаны Цэнтр заал. калекцый імя А.У.Фядзюшына (каля 120 тыс. экз., у т.л. каля 8 тыс. пазваночных жывёл).

Э.Р.Самусенка.

У Мінскім **заалагічным парку**.

ЗААЛАГІ́ЧНЫ ПАРК, з а а п а р к, навукова-асветная ўстанова, у якой у няволі трымаюць дзікіх жывёл для дэманстрацыі, вывучэння, захавання і ўзнаўлення. Адрозніваюць З.п. стацыянарныя, дзе жывёл трымаюць у клетках, вальерах або на вял. агароджаных плошчах (напаўвольна), і рухомыя — выстаўкі (філіялы). У некат. З.п. дэманструюць пароды свойскіх жывёл і бат. калекцыі (зоабат. паркі, напр., у Будапешце, Казані, Парыжы і інш.); бываюць камерцыйныя, у якіх праводзяць паказальныя выступленні з удзелам жывёл. Асн. задачы З.п.: захаванне калекцый дзікіх жывёл (асабліва рэдкіх і знікаючых відаў) мясц. і сусв. фауны ў штучных умовах (напр., у З.п. былі выратаваны ад знікнення алень Давіда, гавайская казарка, конь Пржавальскага і інш.); правядзенне н.-д., вучэбнай і навук.-асв. работы ў галіне заалогіі і аховы прыроды (напр., акліматызацыя жывёл, вывучэнне хвароб і метадаў лячэння, расплоджванне жывёл, правядзенне лекцый, экскурсій і інш.).

З.п. існавалі ў старажытнасці, напр. у Стараж. Рыме, Азіі і Афрыцы, дзе дзікіх жывёл трымалі з дэкар., рытуальнымі і інш. мэтамі; у Стараж. Егіпце, Кітаі З.п. пад назвай «Сады ведаў» існавалі 3 тыс. гадоў назад; у Еўропе вядомы з 14 ст. (у т.л. на Беларусі пад назвай «Мядзведжая акадэмія» існавалі ў гарадах Нясвіж, Смаргонь і належалі Радзівілам). Большасць З.п. заснаваны ў 19 ст.: у Лондане (1828), Берліне (1844), Мадрасе (1855), Мельбурне (1857), Парыжы (1858), Франкфурцена-Майне (1858), Капенгагене (1859), Гамбургу (1863), Нью-Йорку (1865), Калькуце (1875). У 1990 у свеце было каля 850 З.п. (у т.л. ў Расіі каля 15, самыя старыя ў Маскве і С.-Пецярбургу). Буйнейшыя — Берлінскі ў Германіі і лонданскі Рэджэнспарк.

На Беларусі працуюць *Гродзенскі заалагічны парк* і *Мінскі заапарк*.

Э.Р.Самусенка.

ЗААЛАГІ́ЧНЫЯ КА́РТЫ, тое, што *зоагеаграфічныя карты*.

ЗААЛА́ЙСКІ ХРЫБЕ́Т, на Пн Паміра, у Кыргызстане і Таджыкістане. Даўж. 240 км. Выш. да 7134 м (пік Леніна). Складзены са сланцаў, вапнякоў, пясчанікаў, канглмератаў. Пераважае высакагорны рэльеф. Месцамі трапляецца гіпсавы карст. Ледавікі агульнай пл. 1194 км^2. На схілах стэпы і высакагорныя лугі. Ва ўсх. ч. перавал Кызыларт (4280 м), цераз які праходзіць аўтамаб. тракт Ош—Харог.

ЗА́АЛЕ, З а л е (Saale), рака ў Германіі, левы прыток р. Эльба. Даўж. 427 км, пл. бас. каля 24 тыс. км^2. Пачынаецца ў гарах Фіхтэльгебірге, цячэ па раўнінах Цюрынгіі, ніжэй г. Наўмбург па нізіне. Сярэдні расход вады 100 м^3/с, высокія ўзроўні зімой і вясной. Суднаходная на 175 км ад г. Наўмбург. Ад г. Гале каналізаваная (каля 20 шлюзаў). ГЭС. На З. — гарады Заальфельд, Іена, Рудальштат, Наўмбург, Гале, Бернбург, Кальбе.

ЗААЛО́ГІЯ (ад *заа...* + *...логія*), навука пра жывёльныя арганізмы, адзін з асн. раздзелаў *біялогіі*. Вывучае відавую разнастайнасць жывёл (*сістэматыка*), іх будову (*анатомія*), асаблівасці жыццядзейнасці (*фізіялогія*), заканамернасці індывід. развіцця (*эмбрыялогія*), роднасныя сувязі (філагенія), пашырэнне (*зоагеаграфія*), узаемаадносіны з асяроддзем (*экалогія*), асаблівасці паводзін (*эталогія*), вымерлых жывёл (*палеазаалогія*). У З. таксама вылучаюць навукі, якія даследуюць найб. вял. і важныя групы

У **заалагічным музеі** БДУ.

жывёл: *акаралогія*, *арахналогія*, *арніталогія*, *герпеталогія*, *іхтыялогія*, *малакалогія*, *пратысталогія*, *тэрыялогія*, *энтамалогія*. З. звязана з шэрагам с.-г., вет. і мед. навук.

З. як навука зарадзілася ў Стараж. Грэцыі і звязана з імем Арыстоцеля. Як стройная сістэма ведаў аформілася ў канцы 17—18 ст. дзякуючы працам вучоных-прыродазнаўцаў англ. Дж.Рэя, швед. К.Лінея, франц. Ж.Бюфона і Ж.Б.Ламарка і інш. У сярэдзіне 19 ст. створана тэорыя эвалюцыі арган. свету (Ч.Дарвін). У развіцці З. вял. значэнне мелі працы расійскіх вучоных К.М.Бэра, А.А. і У.А.Кавалеўскіх, І.І.Мечнікава, К.Ф.Рулье, А.М.Северцава і інш. У 20 ст. павялічыўся аб'ём фаўністычных даследаванняў па ўсёй планеце, фарміруецца новы малекулярна-біял. аспект сістэматыкі, выкарыстоўваецца карыясістэматыка (на падставе вывучэння колькасці і будовы храмасом), укараняюцца біяхім. метады і метады электроннай мікраскапіі і інш.

На Беларусі даследаванні па З. пачаліся ў 18 ст. Заал. апісанні асобных яе тэрыторый ёсць у працах польск. даследчыка Г.Ржанчынскага (1-я пал. 18 ст.), рус. вучоных І.І.Ляпёхіна (канец 18 ст.), В.М.Севергіна (1-я пал. 19 ст.). У 1924—30 праводзіліся экспедыцыі па вывучэнні наземнай фауны (А.У.Фядзюшын і інш.). Сучасны этап развіцця З. звязаны з працамі І.Ц.Арзамасава, Г.А.Галкоўскай, Г.Г.Вінберга, М.С.Долбіка, П.І.Жукава, С.В.Кахненкі, І.К.Лапаціна, В.І.Мержаеўскай, М.М.Пікуліка, Л.М.Сушчэні, І.М.Сяржаніна, Э.І.Хацько, Н.М.Хмялёвай і інш. Даследаванні вядуцца ў Ін-це заалогіі Нац. АН Беларусі, на кафедрах прыродазнаўчых ф-таў ВНУ, у запаведніках, н.-д. установах с.-г. і вет. профілю і інш. Даследуюцца функцыян. сувязі ў зоацэнозах, заканамернасці матэрыяльна-энергет. ператварэнняў на розных трафічных узроўнях, экалогія і інтрадукцыя каштоўных відаў рыб. Развіваюцца новыя кірункі З.: эксперым. экалогія водных беспазваночных жывёл, ландшафтная фаўністыка і экалогія жывёл, глебавая экалогія; вывучэнне механізмаў і заканамернасцей фарміравання біял. разнастайнасці жывёльнага свету ва ўмовах інтэнсіфікацыі антрапагеннай нагрузкі на прыродныя комплексы; распрацоўка прынцыпаў і метадаў экалагічнага маніторынгу, вядзення Чырв. кнігі, развіцця сеткі асабліва ахоўных тэрыторый; ацэнка ўплыву аварыі на ЧАЭС (1986) на стан фауны. Адна з найб. актуальных праблем — распрацоўка навук. асноў аховы і рацыянальнага выкарыстання жывёльнага свету Зямлі.

Літ.: Наумов Н.П., Карташев Н.Н. Зоология позвоночных. Ч. 1—2. М., 1979; Догель В.А. Зоология беспозвоночных. 7 изд. М., 1981; Жизнь животных. Т. 1—6. 2 изд. М., 1987—89; Институт зоологии Академии наук Беларуси. Мн., 1992.

М.М.Пікулік.

ЗА́АНЕНСКАЯ ПАРО́ДА коз. Малочнага кірунку. Выведзена ў сярэдзіне 19 ст. ў Швейцарыі, у даліне р. Зане (Сарын). Найб. пашыраная ў Зах. і Цэнтр. Еўропе. Гадуюць у Расіі з 1905, на Беларусі — аматары. Выкарыстоўваюць для паляпшэння малочнай прадукцыйнасці мясц. коз.

Козы буйныя, моцнай сухой канстытуцыі, з добра выразным малочным тыпам цела складу, пераважна камолыя. Вымя развітае, з вял. саскамі. Скура тонкая, эластычная. Масць пераважна белая. Жывая маса казлоў 70—80 кг, матак 50—60 кг. Воўна кароткая, восць тонкая. Сярэдняя малочнасць 600—700 кг, найб. — 1000 кг. Тлустасць малака 3,5—4,5%.

Каза **заанеискай пароды**.

ЗААНО́ЗЫ (ад *заа*... + грэч. nosos хвароба), інфекцыйныя і інвазійныя хваробы, на якія хварэюць жывёлы. Да З. адносяць *некрабактэрыёз*, *мыт*, *пастэрэлёз*, чуму свіней і буйн. раг. жывёлы і інш. З. наз. таксама хваробы, якімі чалавек можа заразіцца ад жывёл (*антрапазаанозы*, напр., *шаленства*, *бруцэлёз*, *чума*).

ЗААПА́РК, гл. *Заалагічны парк*.

ЗААСПО́РА (ад *заа*... + *спора*), зооганідый, рухомая клетка (*спора*) водарасцей і некаторых грыбоў, якая служыць для бясполага размнажэння і рассялення. Утвараецца ў аднаклетачным органе — зоаспарангіі. У адрозненне ад тыповай расліннай клеткі пазбаўлена шчыльнай абалонкі. У многіх водарасцей З., акрамя храматафору, маюць таксама чырв. вочка і пульсуючыя вакуолі. У вадзе З. перамяшчаецца з дапамогай жгуцікаў, якія праз некат. час губляе, утварае шчыльную абалонку і развіваецца ў новы арганізм водарасці ці грыба.

ЗААСТРАВЕ́ЧЧА, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Клецк — в. Колкі. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 30 км на ПдУ ад горада і 32 км ад чыг. ст. Клецк, 157 км ад Мінска. 2589 ж., 1032 двары (1997). Філіял Клецкай швейнай ф-кі. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнікі архітэктуры — 2 царквы (2-й пал. 19 ст.).

ЗААТЭ́ХНІЯ (ад *заа*... + грэч. technē майстэрства, уменне), навука пра развядзенне, кармленне, утрыманне, догляд і гасп. выкарыстанне с.-г. жывёл; тэарэт. асновы *жывёлагадоўлі*. Тэрмін «З.» прапанаваў франц. вучоны Ж.Бадэман (1848). Падзяляюць на агульную (вывучае агульныя прынцыпы З.) і прыватную (распрацоўвае сістэму вядзення галін малочнай і мясцовай жывёлагадоўлі, свіна-, авечка-, коне-, птушкагадоўлі, пчалярства, зверагадоўлі і інш., пытанні тэхналогіі вытв-сці асобных відаў прадукцыі: малака, ялавічыны, свініны, прадуктаў птушка- і авечкагадоўлі).

Рэкамендацыі па доглядзе жывёл сустракаюцца ў антычных вучоных. Навукова абгрунтаваныя формы кармлення с.-г. жывёл пачалі распрацоўваць з 17 ст., з канца 18 ст. ствараюцца розныя пароды с.-г. жывёл.

У Беларусі даследаванні па З. вядуцца з 1919 (І.І.Калугін, М.М.Кулагін, М.В.Найдзёнаў і інш.). Яе развіццю спрыялі працы В.С.Антанюка, К.Ф.Барысаўца, А.А.Гайко, З.Д.Гільмана, В.Ц.Горына, М.П.Грыня, В.А.Івановаў, У.П.Лемеша, І.М.Нікітчанкі, С.І.Пляшчанкі, К.М.Сонцава, У.І.Шляхтунова, М.А.Яцко і інш. Н.-д. работа вядзецца ў Бел.НДІ жывёлагадоўлі, БСГА, Віцебскай акадэміі вет. медыцыны, шэрагу ВНУ. Вырашаюцца праблемы павышэння ўстойлівасці жывёлы да хвароб і стрэсаў, прафілактыкі распаўсюджвання спадчынных анамалій, працягласці гасп. выкарыстання і інш. *А.Ф.Трафімаў.*

ЗААФА́ГІ [ад *заа*... + ...*фаг*(і)], жывёлы і расліны, кормам для якіх з'яўляюцца інш. жывёлы. Да З. належаць таксама жывёлы, што кормяцца прадстаўнікамі свайго віду (гл. *Канібалізм*), і паразіты жывёл. Спосаб жыцця З. залежыць ад віду ежы, спосабаў яе здабычы, морфафізіял. і эталагічнай адаптацыі. У актыўных драпежнікаў ёсць органы захопу, умярцвення здабычы, вельмі развіты органы руху і пачуццяў. Стрававальны тракт З. звычайна адносна карацейшы, чым у фітафагаў (арганізмы, якія кормяцца раслінамі). Іх наз. *драпежнікамі*, хоць у некат. выпадках гэты тэрмін не зусім падыходзіць (напр., лешч з'яўляецца З., аднак драпежнікам яго не называюць). З раслін да З. належаць насякомаедныя расліны (напр., расянка круглалістая, тлушчанка звычайная), з жывёл — ваўкі, лісы, ястрабы, краты і інш. Гл. таксама *Некрафагі*, *Капрафагія*, *Эўрыфагія*, *Драпежнікі*, *Драпежныя звяры*, *Сокалападобныя*.

ЗААФІ́ЛІЯ (ад *заа*... + ...*філія*), 1) перакрыжаванае *апыленне* раслін з дапамогай жывёл, звычайна насякомых, што жывяцца кветкавым пылком, нектарам, сакаўнымі тканкамі кветкі і інш., іншы раз (пераважна ў тропіках) — птушкамі (калібры) і млекакормячымі. 2) Адна з форм палавой ненармальнасці ў чалавека, пры якой ён атрымлівае задавальненне ад сексуальнага кантакту з жывёлай.

ЗААЦЫ́ДЫ [ад *заа*... + ...*цыд*(ы)], хімічныя сродкі знішчэння шкодных пазваночных. Выкарыстоўваюць у асн. для барацьбы з грызунамі (радэнтыцыды), у прыватнасці мышамі і пацукамі (*ратыцыды*), а таксама птушкамі (*авіяцыды*). Моцныя яды. Вытв-сць, захоўванне і выкарыстанне дапускаюцца толькі з дазволу адпаведных дзярж. органаў.

ЗАБАБА́ХІН Яўген Іванавіч (16.1.1917, Масква — 27.12.1984), савецкі фізік.

Акад. АН СССР (1968; чл.-кар. 1958). Герой Сац. Працы (1953). Ген.-лейт. авіяцыі (1977). Скончыў Ваенна-паветраную інжынерную акадэмію (1944), дзе і працаваў. Навук. працы па гідрадынаміцы выбуху і ўдарных хваль. Ленінская прэмія 1958, Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951, 1953.

Тв.: Кумуляция энергии и ее границы // Успехи. физ. наук. 1965. Т. 85, вып. 4.

Я.І.**Забабахін**.

Д.К.**Забалотны**.

ЗАБАГО́НСКІ Сямён Аляксандравіч (14.1.1910, в. Залучча Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. — 27.1.1955), Герой Сав. Саюза (1943). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Цэнтр., Варонежскім, 4-м Укр. франтах. Пам. камандзіра ўзвода сяржант З. вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра на Пн ад г.п. Ржышчаў у баях за вызваленне Кіеўскай вобл. На радзіме на ўшанаванне яго памяці пастаўлена стэла.

ЗАБАЙКА́ЛЛЕ, прыродная тэрыторыя, размешчаная на У ад воз. Байкал (Расія). Распасціраецца амаль на 1000 км з Пн на Пд ад Патамскага і Паўн.-Байкальскага нагор'яў да дзярж. мяжы Расіі з Манголіяй і Кітаем і больш чым на 1000 км з З на У ад берагоў Байкала да зліцця рэк Шылка і Аргунь. Пераважаюць сярэдневышынныя горы (выш. 1200—1800 м), акаймаваныя з Пн і З поясам высокіх гор (выш. да 2999 м). Сярэднягорныя хрыбты (Даурскі, Малханскі, Алёкмінскі Станавік) чаргуюцца з міжгорнымі катлавінамі байкальскага тыпу (Баргузінская, Верхнеангарская, Муйска-Куандзінская і інш.). На Пн і З вылучаюцца моцна расчлянёныя высакагорныя хрыбты Станавога нагор'я (Каларскі, Паўн.- і Паўд.-Муйскі, Удакан і інш.) з сучаснымі ледавікамі. Пашырана шматгадовая мерзлата і звязаныя з ёй формы рэльефу. У геал. будове З. вылучаюцца рознаўзроставыя складкавыя сістэмы паўн.-ўсх. распасціранння, якія змяняюцца з ПнЗ на ПдУ: байкальская (рыфейскія граніты і метамарфізаваныя пароды рыфею і ніжняга пратэразою); ніжнепратэразойская (глыбокаметамарфізаваныя пароды архею і ніжняга пратэразою); каледонская (ніжнепалеазойскія граніты, тэрыгенна-карбанатна-вулканагенныя адклады кембрыю); герцынская (тэрыгенныя і тэрыгенна-карбанатная вулканагенныя тоўшчы палеазою). Каледонская і герцынская складкавасці перакрыты вузкімі ўпадзінамі, запоўненымі тэрыгенна-вулканагеннымі адкладамі юры і мелу. Цэнтр. ч. з каледонскай складкавасцю перакрыта кайназойскімі платобазальтамі. У тэктоніцы З. вял. значэнне маюць стараж. і маладыя разломы паўн.-ўсх. напрамку. Радовішчы золата, тытану, жал. руды, цынку, вальфраму, малібдэну, бурага і каменнага вуглёў і інш. Клімат рэзка кантынентальны. Зіма працяглая і суровая. Сярэднія т-ры студз. ад -23 °С на Пд да -33 °С на Пн і ПдУ, абс. мінімум дасягае -58 °С. Лета цёплае, у высакагор'ях халаднаватае. Сярэдняя т-ра ліп. ў катлавінах ад 10 да 20 °С, у гарах (на выш. 2500 м) — ад 5 да 7 °С. Колькасць ападкаў павялічваецца ў напрамку з ПдУ на ПнЗ і ад днішчаў катлавін (250—300 мм) да верхняй ч. хрыбтоў (700—1000 мм за год). Рэкі належаць да бас. Байкала, Лены і Амура; найб. — Віцім, Алёкма, Селенга, Шылка, Аргунь. Самыя вял. азёры — Байкал, Гусінае, Ераўнінскае і інш. Большая ч. З. размешчана ў зоне тайгі, якая на Пд суседнічае з лесастэпамі і сухімі стэпамі. Характэрна цеснае перапляценне гарыз. занальнасці і вышыннай пояснасці ландшафтаў. Нізкагор'і і раўніны ў паўд.-ўсх. ч. З., а таксама некаторыя катлавіны заняты стэпамі (пераважна злакава-разнатраўнымі). На ўскраінах міжгорных катлавін і ў ніжняй ч. схілаў (да выш. 1000—1200 м) горны лесастэп, вышэй (да 1900 м на Пд і 1400 на Пн) горная тайга. Пераважаюць лясы з лістоўніцы даурскай, трапляецца кедр, вышэй за 1600—2000 м — зараснікі кедравага сланіку, лішайнікавая тундра, на Пд — лістоўнічна-бярозавыя і хваёвыя лясы. У фауне З. тыповыя для стэпаў грызуны; у лясах — касуля, лось, вавёрка, собаль, бурундук, кабарга, ізюбр, мядзведзь. Трапляюцца паўночныя алені, горныя казлы, бараны. У межах З. Байкальскі, Баргузінскі і Сахандзінскі запаведнікі, Забайкальскі прыродны нац. парк. На тэр. З. размешчаны Бурацыя, Чыцінская і Іркуцкая вобл. Расіі.

ЗА́БАЛАНЬ, вонкавыя маладыя фізіялагічна актыўныя слаі драўніны, якія знаходзяцца непасрэдна за *камбіем*. Адрозніваюцца ад унутр. ч. (ядра) больш светлай афарбоўкай, меншай мех. трываласцю і ўстойлівасцю да пашкоджанняў грыбамі і насякомымі.

ЗА́БАЛАЦЦЕ, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 34 км на ПдЗ ад г. Мсціслаў, 72 км ад Магілёва, 15 км ад чыг. ст. Ходасы. 408 ж., 162 двары (1997). Базавая школа, б-ка, аддз. сувязі.

ЗА́БАЛАЦЦЕ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Рагачоў, 130 км ад Гомеля. 653 ж., 273 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў. Помнік архітэктуры — парк (2-я пал. 19 ст.).

ЗА́БАЛАЦЦЕ, біялагічны заказнік у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Створаны ў 1979 як заказнік-журавіннік рэсп. значэння для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Пл. 1957 га (1997). Размешчаны на вярховым балоце са шматлікімі мінер. ўчасткамі (50% агульнай плошчы). У складзе балотнай расліннасці рэдкалесныя (хваёва-кусцікава-сфагнавыя і інш.) і бязлесныя фітацэнозы, пашыраны журавіны; лясы хваёвыя, бярозавыя і чорнаальховыя. На мінер. участках пераважаюць хваёвыя, бярозавыя, яловыя, асінавыя лясы кіслічнага, імшыстага, чарнічнага і даўгамошнага тыпаў.

ЗА́БАЛАЦЬ, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл., на аўтадарозе Радунь—Астрына. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 52 км на ПдЗ ад г.п. Воранава, 80 км ад Гродна, 46 км ад чыг. ст. Баступы. 1137 ж., 448 двароў (1997).

Вядома з канца 14 ст. З канца 15 ст. да пач. 20 ст. належала Глінскім, Нарбутовічам, Сапегам, Палубенскім, Габаям, Тышкевічам, Волянам, Плямяннікавым і інш. З 1536 мястэчка. З 1795 у Рас. імперыі. У пач. 19 ст. цэнтр воласці Лідскага пав. Віленскай губ. У 1880-я г. 75 ж. З 1921 у Польшчы, цэнтр гміны Лідскага пав. Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета Радунскага р-на. З 1962 у Воранаўскім р-не. У 1971 — 892 ж., 321 двор.

Сельгасхімія. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Петрапаўлаўскі касцёл (1803—12).

ЗАБАЛО́ТНЫ Даніла Кірылавіч (28.12.1866, с. Забалотнае Вінніцкай вобл., Украіна — 15.12.1929), украінскі мікрабіёлаг. Акад. АН Украіны (1922). Акад. АН СССР (1929). Скончыў Новарасійскі (1891; Адэса) і Кіеўскі (1894) ун-ты. З 1898 у Пецярбургскім жаночым мед. ін-це, у 1919—23 рэктар Адэскага мед. ін-та. У 1928 арганізаваў у Кіеве Укр. ін-т эпідэміялогіі і мікрабіялогіі АН, які носіць яго імя. У 1928—29 прэзідэнт АН Украіны. Кіраўнік Сан.-эпідэміял. камісіі Гал. ваеннасан. ўпраўлення Чырв. Арміі, арганізатар курсаў ваен. і грамадз. урачоў-эпідэміёлагаў. Стварыў вучэнне пра прыродную ачаговасць чумы (1922); эксперыментальна даказаў ідэнтычнасць бубоннай і лёгачнай чумы. Навук. працы па вакцынапрафілактыцы і эпідэміялогіі асабліва небяспечных і інш. інфекц. хвароб.

ЗАБАЛО́ЦКАЯ Людміла Васілеўна (н. 27.12.1949, г. Крычаў Магілёўскай вобл.), бел. паэтэса. Скончыла БДУ (1974). Працавала ў выд-ве «БелСЭ» (1974—84), на Бел. тэлебачанні, нам. гал. рэдактара час. «Пралеска» (1991—95), у выд-ве «Полымя», з 1996 у час. «Адукацыя і выхаванне». Друкуецца з 1967. Аўтар зб-каў вершаў «Сакавік» (1974), «Радаводны васілёк» (1981), «Святло палыну» (1989), «Струны памя-

ці» (1991). Асн. тэма творчасці — жаночая доля, каханне і пошукі жыццёвай гармоніі. Паэтэса чулая да маст. слова, настойлівая ў пошуку сродкаў узбагачэння паэт. тэматыкі. Пераклала на бел. мову раман В.Скота «Айвенга» (1997).

ЗАБАЛО́ЦКІ Анатоль Дзмітрыевіч (н. 16.10.1935, с. Сіда, Краснаярскі край, Расія), бел. кінааператар. Засл. дз. маст. Беларусі (1967) і Расіі (1976). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1960). У 1960—69 працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Творчай манеры З. ўласцівы выразнасць партрэтных характарыстык, майстэрскае валоданне святлом. Зняў фільмы: маст. «Першыя выпрабаванні» (1960—61), «Апавяданні пра юнацтва» (1961), «Маленькія летуценнікі» (1963), «Праз могілкі» (1965), «Альпійская балада» (1966); дакумент. «Сведкі вечнасці» (1965, рэж.-аператар), «Слова маці» (1978, сцэнарыст, рэж.) і інш. Прэмія Ленінскага камсамола 1980.

ЗАБАЛО́ЦКІ Мікалай Аляксеевіч (7.5.1903, г. Казань, Расія — 14.10.1958), рускі паэт. Скончыў Ленінградскі пед. ін-т імя Герцэна (1925). У 1936 беспадстаўна рэпрэсіраваны. Пакаранне адбываў на Д. Усходзе, у Алтайскім краі і Карагандзе. З 1946 у Маскве. Друкаваўся з 1928. Першая кн. вершаў «Слупкі» (1929). З. — лірык філас. складу. У яго паэзіі роздум пра адвечны кругаварот прыроды, перамогу чалавечага розуму і працы над стыхіяй, сцвярджэнне велічы чалавека (паэмы «Урачыстасць земляробства», 1933, «Звар'ялцелы воўк», 1931, апубл. 1965, «Дрэвы», 1933, апубл. 1965, і інш.). Лірыцы характэрны аналітычнасць стылю, маляўнічасць і пластычнасць вобразаў (зб-кі «Вершы», 1948; 1957; 1959). Пераклаў «Слова пра паход Ігаравы», «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш.Руставелі, творы груз., укр., італьян., венг. паэтаў. Для дзяцей апрацаваў раман Ф.Рабле «Гарганцюа і Пантагруэль». На бел. мову творы З. перакладалі С.Грахоўскі, Я.Міклашэўскі і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1983—84; Избр. соч. М., 1991; Столбцы. СПб., 1993; Бел. пер. — Чырвоныя і сінія. Мн., 1932; [Вершы] // Далягляды. Мн., 1979; [Вершы] // Братэрства. Мн., 1986.

Літ.: Турков А.М. Николай Заболоцкий. М., 1981. *І.У.Саламевіч.*

ЗАБАЛО́ЦЦЕ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., каля аўтадарогі Гомель—Віцебск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 22 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Буда-Кашалёва, 48 км ад Гомеля. 298 ж., 126 двароў (1997). Сярэдняя школа, б-ка, аддз. сувязі.

ЗАБАЛО́ЦЦЕ, вёска ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 5 км на ПдЗ ад горада і 2 км ад чыг. ст. Смалявічы, 36 км ад Мінска. 763 ж., 262 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Георгіеўская царква (пач. 20 ст.).

ЗАБАЛО́ЧВАННЕ, гл. ў арт. *Балотаўтваральны працэс.*

ЗАБА́РА Генадзь Іванавіч (н. 18.5.1952, саўгас імя Леніна, Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл.), бел. кларнетыст, педагог. Засл. арт. Беларусі (1987). Скончыў Мінскае муз. вучылішча імя Глінкі (1970, клас У.*Скараходава*; у 1975—80 выкладаў у ім), Муз.-пед. ін-т імя Гнесіных у Маскве (1975), асістэнтуру-стажыроўку пры ім (1981). З 1975 саліст Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі, з 1986 саліст-інструменталіст Бел. філармоніі, з 1991 артыст ансамбля салістаў «*Класік-Авангард*». З 1980 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі (дацэнт з 1988). У сольных канцэртах выканаў анталогію камернай музыкі для кларнета з твораў класікі і сучасных кампазітараў, у т.л. бел., прысвечаных менавіта З. (Г.Вагнера, В.Войціка, У.Дамарацкага, К.Цесакова і інш.). Аўтар пералажэнняў для кларнета твораў Л.Бетховена, І.Брамса, К.Вебера, Р.Шумана, Ф.Шуберта і інш. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу маладых выканаўцаў (1979, Мінск), міжнар. конкурсу «Пражская вясна» (1981). Сярод яго вучняў П.Навуменка, Г.Казадой, Я.Ягудзін.

ЗАБАСТО́ЎКА, с т а ч к а, калектыўнае спыненне працы рабочымі з мэтай задавальнення сваіх патрабаванняў. Праводзіцца ў розных формах: папераджальная, салідарнасці, на адным прадпрыемстве, агульная і інш. Агульная З. — спыненне працы большасцю прадпрыемстваў у розных галінах прам-сці, на транспарце і інш. у горадзе, рэгіёне, краіне.

Першая ў гісторыі Еўропы З. адбылася ў 1345 у Фларэнцыі. Спачатку стачкі мелі эканам. характар, былі стыхійнымі і неарганізаванымі. У 16—18 ст. эканам. З. спалучаліся з паліт. патрабаваннямі, часам суправаджаліся ўзбр. барацьбой (*Ліёнскія паўстанні 1831, 1834*; *Сілезскае паўстанне ткачоў 1844* і інш.). У 1-й пал. 19 ст. забастовачны рух набыў найб. размах у Вялікабрытаніі (масавая паліт. З. ў крас. 1820). У кастр. 1835 адбылася адна з першых буйных З. у Расіі (на фабрыцы Асокіна ў Казані). Забастовачная барацьба садзейнічала ўзнікненню рабочых арг-цый (прафсаюзы, паліт. партыі). Ва ўпартай барацьбе з буржуазіяй на працягу 19 ст. працоўныя большасці капіталіст. дзяржаў дабіліся легалізацыі права на стачку. У канцы 19 ст. рэзка абвастрыўся стачачны рух у ЗША (у 1896—1905 — 21 950 З.), Францыі (1896—1905 — 4925 З.), Германіі (1900—07 — 14 790 З.), Расіі (1895—1904 — 1765 З.).

У Беларусі першыя стачкі адбыліся ў 19 ст., мелі лакальны і абарончы характар. У пач. 20 ст. яны набываюць наступальны, часам паліт. характар. У 1903 адбылося 20 паліт. З., на працягу 2 месяцаў 1904 — 17 З. Асабліва часта паліт. З. адбываліся ў 1905. У кастр. 1905 працоўныя Беларусі прынялі ўдзел у агульнарас. паліт. стачцы (у Мінску баставалі ўсе прадпрыемствы, пошта, тэлеграф; паліт. стачкі адбыліся ў Гомелі, Брэсце, Оршы, Лунінцы, Баранавічах, Пінску; у 25 з 35 паветаў Беларусі прайшлі З. с.-г. рабочых). У 1927—28 зарэгістравана 370 З. у Зах. Беларусі. Адбываліся масавыя выступленні працоўных Брэста, Ліды, Беластока, Пінска, Маладзечна, Навагрудка і інш. Эканам. патрабаванні спалучаліся з барацьбой за нац. вызваленне. Супраць сац. палітыкі ўрадаў БССР і СССР былі скіраваны забастоўкі ў Гомелі (крас. 1990), Мінску (крас. 1991). Паводле Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс законаў аб працы Рэспублікі Беларусь» ад 15.12.1992 працоўныя Беларусі маюць права на З.

М.А.Сакалова (З. ў Беларусі)

ЗАБАЎЛЯ́НКІ, п а ц е ш к і, кароткія вершаваныя прыгаворы або песенькі, якімі забаўляюць і суцяшаюць дзіця; жанр *дзіцячага фальклору*. З. ўзбуджаюць у дзіцяці эмоцыі, прывучаюць да першых самастойных рухаў, знаёмяць з навакольным светам. Умоўна падзяляюцца на звязаныя з рознымі гульнёвымі рухамі («Ладачкі») і на творы, якія пацяшаюць толькі гучаннем («Ходзіць бай па сцяне»). Як і ў *калыханках*, у іх яскрава выяўляецца імправізацыя. Часцей сустракаюцца дыялагічныя і апавядальныя З., насычаныя экспрэсіўна-эмац. лексікай, рэфрэнамі, у іх шмат гукапераймальных і дзіцячых слоў, пры гэтым асн. сэнсавая нагрузка прыпадае на дзеяслоўныя формы. Канкрэтнасць адлюстравання абумовіла вобразныя сродкі паэт. мовы: эпітэты па знешняй прыкмеце, гіпербалы, літоты і інш., сустракаюцца элементы алегорыі.

Публ.: Дзіцячы фальклор. Мн., 1972.

Літ.: Гл. пры арт. *Дзіцячы фальклор.*

Г.А.Барташэвіч.

ЗАБА́ШАВІЧЫ, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 25 км на Пд ад горада і 27 км ад чыг. ст. Барысаў, 103 км ад Мінска. 1422 ж., 631 двор (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ЗАБА́ШТА Любоў Васілеўна (3.2.1918, г. Прылукі, Украіна — 21.7.1990), украінская паэтэса. Скончыла Адэскі водны ін-т (1941). Друкавалася з 1935. Любоў да Радзімы, каханне, мацярынскае шчасце, гераіка ваен. і мірных гадоў — асноўныя тэмы яе паэт. творчасці (зб-кі вершаў «Новыя берагі», 1950; «Дарогі дружбы», 1953; «Песня і хлеб», 1961; «Незабудкі», 1966; «Вераг надзеі», 1974; «Кіеўская гара», 1982, і інш.). Аўтар п'ес «Вяселле ў Цярнах» і «Ружы на камені» (абедзве 1963), драм. і ліра-эпічных паэм «Цярновы лёс» (1961), «Маруся Чурай» (1968), «Раксалана» (1971), «Леся Украінка» (1973), раманаў «Там, за ракою — маладосць» (1970), «Софія Кіеўская» (1982), аповесцей «Крылы Арсена Дораша» (1968), «Спаленне мадонны» (1989), кніг вершаў для дзяцей «Калі я вырасту» (1975), «Сеяльшчыкі» (1984). Пераклала на ўкр. мову кн. В.Віткі «Птушыная школа», паасобныя творы Э.Агняцвет. На бел. мову творы З. пераклалі Агняцвет, М.Аўрамчык,

А.Бялевіч, В.Вярба, Х.Жычка, К.Камейша і інш.

Тв.: Вибране. Київ, 1987. *В.А.Чабаненка.*

ЗАБЕ́ЛА Васіль Сяпанавіч (20.5.1901, в. Кішчына Слабада Барысаўскага р-на Мінскай вобл. — 4.12.1949), дзяржаўны дзеяч БССР. Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1935). У 1922—24 у Чырв. Арміі, пасля на сав. і парт. рабоце. У 1938—45 нарком, з сак. 1949 міністр камунальнай гаспадаркі БССР. У 1945—49 нам. старшыні СМ БССР. У Вял. Айч. вайну ўдзельнічаў у арганізацыі партыз. руху на Беларусі, чл. Мінскага падп. абкома КП(б)Б. Дэп. Вярх. Савета БССР з 1947. Канд. у чл. ЦК КП(б)Б у 1949.

ЗАБЕ́ЛА Леанід Яўгенавіч (н. 7.9.1947, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1992). Скончыў БДУ (1970), дзе і працуе з 1973. Навук. працы па якаснай тэорыі аптымальных працэсаў. Распрацаваў метад рашэння выраджаных задач для сістэм са спазненнем з выкарыстаннем канечнага набору матрычных функцый.

Тв.: Исследование особых управлений в системах с запаздыванием с помощью матричных импульсов // Дифференциальные уравнения. 1984. Т. 20, № 8.

ЗАБЕ́ЛА Мікалай Міхеевіч (3.10.1862, Чэрыкаўскі пав. Магілёўскай губ. — 1885), удзельнік рэв.-народніцкага руху. У час вучобы ў Магілёўскай гімназіі з 1875 удзельнічаў у гуртках «самаразвіцця». З 1877 чл. гуртка Л.С.*Залкінда*, які ў 1880 далучыўся да «Народнай волі». Вёў агітац. работу сярод сялян на бел. мове, вывучаў і збіраў фальклор. У час вучобы ў Кіеўскім ун-це стварыў «Камуну магілёўцаў». У 1882 чл. нарадавольскага гуртка У.І.Бычкова (гл. ў арт. *Бычковы*). У крас. 1883 арыштаваны, у 1884 высланы ва Усх. Сібір. Патануў у р. Селенга. *М.Б.Ласінскі.*

ЗАБЕ́ЛА (Урубель) Надзея Іванаўна (1.4.1868, г. Каўнас, Літва — 4.7.1913), расійская спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Жонка М.А.*Урубеля*. Скончыла Пецярбургскую кансерваторыю (1891). Спявала ў оперных т-рах Кіева, Тбілісі, Пецярбурга і інш. У 1897—1902 салістка Маскоўскай прыватнай рус. оперы С.Мамантава, у 1904—11 у Марыінскім т-ры. Найб. блізкія ёй былі вобразы гераінь у операх М.Рымскага-Корсакава: Вольга, Панначка, Снягурачка, Валхава («Пскавітянка», «Майская ноч», «Снягурачка», «Садко»); упершыню выканала партыі Веры, Марфы, Царэўны-лебедзі, царэўны Ненаглядная Красы («Баярыня Вера Шэлога», «Царская нявеста», «Казка пра цара Салтана», «Кашчэй бессмяротны»), напісаныя спецыяльна для яе. У апошнія гады жыцця выступала ў канцэртах, пераважна з рамансамі Рымскага-Корсакава.

Літ.: Барсава Л. Н.И.Забела-Врубель глазами современников. Л., 1982.

ЗАБЕ́ЛА Тодар Іванавіч (сак. 1896, в. Чабусы Любанскага р-на Мінскай вобл. — 1935?), бел. гісторык. Скончыў БДУ (1925). З 1925 вучыўся ў аспірантуры БДУ. З 1928 навук. супрацоўнік у Інбелкульце і Бел. АН, з 1929 у Магілёўскім дзярж. архіве. Даследаваў гісторыю сялянства і сельскай гаспадаркі, гарадоў Беларусі 16—18 ст., вывучаў феад. памесце і становішча прыгонных сялян. 24.7.1930 арыштаваны па справе *«Саюза вызвалення Беларусі»*, 10.4.1931 асланы на 5 гадоў у г. Елабуга (Татарская АССР), дзе і памёр. Рэабілітаваны ў 1957.

Тв.: Землеўласнік і земляроб па Статуту Літоўскаму 1588 г. Мн., 1928; Панская гаспадарка на Беларусі і быт падданага сялянства ў другой палове XVIII ст. Мн., 1928; Места Берасцейскае ў XVI ст.: (сац.-экан. нарыс). Мн., 1930. *У.М.Міхнюк.*

ЗАБЕ́ЛА Уладзімір Паўлавіч (н. 17.3.1939, Вільня), бел. рэжысёр, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1990), праф. (1995). Скончыў Ленінградскі ін-т т-ра, музыкі і кінематаграфіі (1970). З 1973 на Бел. тэлебачанні, з 1984 гал. рэжысёр Брэсцкага абл. драм. т-ра, з 1987 у Бел. АМ (з 1994 заг. кафедры кінатэлемастацтва). Пастаноўшчык тэатр. спектакляў: «Амністыя» М.Матукоўскага (1971), «Свой востраў» Р.Каугвера (1972) у Бел. т-ры імя Я.Коласа; «Бярозавая галіна» Ю.Візбара (1985), «Хітрыкі Скапэна» Мальера (1990) і інш. у Брэсцкім драм. т-ры, а таксама тэлевізійных: «Крыло цішыні» паводле Я.Сіпакова (1978), «Завеі, снежань» паводле І.Мележа (1979, абодва Дзярж. прэмія Беларусі 1982), «Лісце каштанаў» паводле У.Караткевіча (1980), «Я, Іван Дамінікавіч» паводле В.Вярбоўскай (1988) і інш. Аўтар творчых тэлепартрэтаў вядомых дзеячаў бел. л-ры і мастацтва, дакумент. тэлефільмаў і тэлепраграм па гісторыі і духоўнай спадчыне бел. народа. Пастаноўкі вызначаюцца лаканізмам сцэнаграфіі і сканцэнтраванасцю ўвагі на акцёрскім выкананні. *Н.В.Грэская.*

ЗАБЕ́ЛА Яўген Пятровіч (н. 12.1.1940, в. Мерашыно Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне электраэнергетыкі. Д-р тэхн. н. (1992). Скончыў Бел. ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1961). З 1965 у Бел. філіяле Энергет. НДІ (з 1992 Бел. н.-д. цеплаэнергет. ін-т). Навук. працы па надзейнасці энергазабеспячэння, стварэнні і ўкараненні шматканальных і шматузроўневых сістэм энергаўліку і кіравання энергаспажываннем.

Тв.: О распределении уровней надежности в цепи электроснабжения «источник—потребитель» // Изв. вузов. Энергетика. 1968. № 2; Отечественный и зарубежный опыт внедрения микропроцессорных систем учета, контроля и регулирования электропотребления. Мн., 1985.

ЗАБЕ́ЛІН Іван Ягоравіч (29.9.1820, г. Цвер, Расія — 13.1.1909), расійскі гісторык і археолаг. Правадз. чл. АМ (1892), чл.-кар. (1884), ганаровы чл. Пецярбургскай АН (1907). З 1859 у Археал. камісіі ў Пецярбургу, кіраўнік раскопак на Пд Расіі. У 1862—63 раскапаў курган *Чартамлык*, у 1869—72 кіраваў раскопкамі Фанагорыі, у 1873 — Ольвіі. У 1879—88 старшыня Т-ва гісторыі і старажытнасцей рас., удзельнічаў у работах камісій па рэстаўрацыі стараж. жывапісу ў Благавешчанскім і Успенскім саборах Маск. Крамля, ва Успенскім саборы Уладзіміра. Адзін з арганізатараў *Гістарычнага музея* ў Маскве, у 1883—1908 яго фактычны кіраўнік. Аўтар прац па гісторыі стараж.-рус. мастацтва, побыту рус. народа 16—18 ст., гісторыі Масквы.

Тв.: История города Москвы. М., 1990.

Літ.: Формозов А.А. Историк Москвы И.Е.Забелин. М., 1984; Сахаров А.Н. И.Е.Забелин: новая оценка творчества // Вопр. истории. 1990. № 7.

ЗАБЕ́ЛІНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Нача, за 28 км на ПдЗ ад г. Полацк. Пл. 0,32 км², даўж. 780 м, найб. шыр. 450 м, даўж. берагавой лініі больш за 2 км. Пл. вадазбору 126 км². Схілы катлавіны выш. 5—8 м, разараныя, на Пд пад хмызняком. Злучана пратокай з азёрамі Лесава і Арэхаўна.

ЗАБЕ́ЛЫ, фальварак, гл. ў арт. *Валынцы*.

ЗАБЕ́ЛЫ, дзярж. дзеячы, шляхецкі род герба «Тапор» у ВКЛ. Родапачынальнік — баярын Татвойш, які ў 2-й пал. 15 ст. атрымаў ад вял. кн. Казіміра зямлю ў Мядэкшах на Ковеншыне. Унука Татвойша звалі Забела, ад яго і пайшоў род З. З 17 ст. карысталіся графскім тытулам. Найб. вядомыя:

Ян (? — крас. 1761), кашталян мсціслаўскі з 1752. Антоній (?—18.8.1776), генерал-паручнік войска ВКЛ (1761), маршалак ковенскі ў 1744—61, вял. лоўчы ВКЛ у 1761—75. Юзаф (?—9.5.1794), сын Антонія, вял. лоўчы ВКЛ у 1775—93, гетман польны ВКЛ з 1793. Маршалак *Таргавіцкай канфедэрацыі*, за што пакараны смерцю ў час *паўстання 1794*. Шыман (?—1793), кашталян мінскі з 1787. *У.М.Вяроўкін-Шэлюта.*

ЗАБЕ́ЛЬСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бярозаўка, за 4 км на Пн ад г. Глыбокае. Пл. 0,44 км², даўж. 1,5 км, найб. шыр. 490 м, найб. глыб. 2,1 м, даўж. берагавой лініі 4,7 км. Пл. вадазбору 11,1 км². Схілы катлавіны выш. 3—9 м, разараныя, на Пд 14—15 м, пад лесам. Берагі пясчаныя, месцамі забалочаныя, на ПдУ і ПдЗ сплавінныя. Участкамі пойма шыр. да 50 м, забалочаная, пад хмызняком. Дно плоскае, сапрапелістае. На Пд невял. востраў пл. 0,7 га. Зарастае ў прыбярэжнай частцы. Злучана ручаём з азёрамі Марцыбылінскае і Мушкацкае.

ЗАБЕ́ЛЬСКІ ДАМІНІКА́НСКІ КАЛЕ́ГІУМ. Дзейнічаў у 1716—1838 пры дамініканскім кляштары св. Георгія ў фальварку Забелы каля в. Валынцы (Верхнядзвінскі р-н). Засн. на сродкі памешчыка Г.Шчыта. У 1787 калегіуму належала 5 фальваркаў з гадавым дахадам 2547 руб. Пры калегіуме дзейнічаў *Забельскі школьны тэатр*. У 1802 — 3 класы з тэрмінам навучання 6 гадоў, 6

выкладчыкаў, 80 вучняў. З 1803 павятовае вучылішча ў складзе Віленскай навуч. акругі. У 1811 пераўтворана ў гімназію, але дамініканцы захавалі і фінансавую самастойнасць. У 1817 — 6 класаў, 6 выкладчыкаў, 126 вучняў, павышаны ўзровень прыродазнаўчых дысцыплін. Пры гімназіі дзейнічала ніжэйшае духоўнае вучылішча. У 1821 дамініканцы прапанавалі міністэрству нар. асветы стварыць на базе гімназіі акадэмію з 3 ф-тамі, але беспаспяхова. У 1838 гімназія закрыта. Сярод вучняў пісьменнік А.*Вярыга-Дарэўскі*. *А.Ф.Самусік.*

ЗАБЕ́ЛЬСКІ ШКО́ЛЬНЫ ТЭА́ТР. Існаваў у 18 ст. ў Забельскім дамініканскім калегіуме (в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.). Меў багаты разнастайны рэпертуар, створаны мясц. аўтарамі — выкладчыкамі паэтыкі і рыторыкі; яго спектаклі былі асветніцкія па змесце і класіцыстычныя па форме. Росквіт т-ра прыпадае на 1787—91, калі на чале калегіі стаялі Ч.Папроцкі (да 1788) і К.Вяшчыцкі. У гэты перыяд пастаўлены трагедыя на польск. мове «Свабода ў няволі» і бел.-польск. «Камедыя» К.Марашэўскага, польск. трагедыя «Сапар» і камедыя «Доктар па прымусе» М.Цяцерскага (перапрацоўка аднайм. п'есы Мальера); у 1789 — польск. трагедыя «Крэз» і камедыя нораваў «Пышнагольскі» І.Юрэвіча і інш. Выконваліся таксама дыялогі — судовая забаўка «Пчолы», школьная гульня «Пра ашчасліўленне чалавека», вершаваныя віншаванні і падзякі на польск. і лац. мовах.

Літ.: Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 320—324.

ЗАБЕ́ЛЬСКІЯ ЗБО́РНІКІ, рукапісныя зборнікі, складзеныя ў 1787—91 на бел., польскай і лац. мовах выкладчыкамі Забельскай дамініканскай калегіі (в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.) для мясцовага школьнага тэатра. Уключаюць камедыі і трагедыі «Свабода ў няволі» і «Камедыя» К.Марашэўскага, «Доктар па прымусе», «Сапар», «Фемістокл», «Камедыя» і «Шлюб, пастаўлены дагары нагамі штучкамі арлекіна» М.Цяцерскага, «Пышнагольскі» і «Крэз» І.Юрэвіча, аперэту «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас» (тэкст М.Цяцерскага, музыка Р.Вардоцкага) і сцэн. дыялогі «Сяброўская парука», «Пчолы», «Пра ашчасліўленне чалавека», вершаваныя канты, віншаванні і падзякі А.Козела, Г.Скораня, А.Зубрыцкага, М.Косава, Г.Паўловіча. Большасць твораў асветніцкія па ідэі і класіцысцкія паводле стылю. Зберагаюцца ў Цэнтр. б-цы АН Літвы.

Літ.: Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980.

А.В.Мальдзіс.

ЗА́БЖЭ (Zabrze), горад на Пд Польшчы, у Катавіцкім ваяв., у Верхнесілезскай агламерацыі. Вядомы з 1243. 202 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог. Здабыча каменнага вугалю, вытв-сць коксу, стальных канструкцый, кабелю, горнае машынабудаванне, металаапр., радыёэлектронная, дрэваапр., шкляная, гумавая, харч. прам-сць. Навук. ўстановы АН Польшчы. Тэатр, Дом музыкі і танца, музеі — гарадскі і вугальнай прам-сці.

ЗАБІ́ЛА Наталля Львоўна (5.3.1903, С.-Пецярбург — 6.2.1985), украінская пісьменніца. Скончыла Харкаўскі ін-т нар. адукацыі (1925). Друкавалася з 1924. Дэбютавала кнігай вершаў для дзяцей «Далёкі край» (1927). Аўтар зб-каў вершаў «Дні трывог» (1945), «Наша Радзіма» (1947), «Вясёлыя сябры» (1975), кн. прозы «Радня» (1934), «Апавяданні, казкі, аповесці» (1962), рамана «Трактарабуд» (ч. 1—2, 1931—32) і інш. Вядома як перакладчыца. На бел. мову асобныя творы З. пераклалі Э.Агняцвет, В.Вярба.

Літ.: Бичко В.В. Наталя Забіла. Київ, 1963.

ЗАБЛО́ЦКІ-ЛА́ДА Тадэвуш Гілярыевіч, гл. *Лада-Заблоцкі* Т.Г.

ЗАБЛУ́ДАЎСКАЯ ДРУКА́РНЯ. Існавала ў 1568—70 у мяст. Заблудава Гродзенскага пав. (цяпер тэр. Польшчы). Засн. ў маёнтку гетмана ВКЛ Р.Хадкевіча першадрукарамі І.*Фёдаравым* і П.*Мсціслаўцам*, якія ў канцы 1560-х г. перасяліліся з Масквы на Беларусь. У друкарні, верагодна, працавалі вучань Фёдарава Грынь *Івановіч* (вядомы пазней як майстар па вырабе шрыфтоў) і друкар В.*Гарабурда*. Разам з маскоўскімі друкарскімі матэрыяламі тут шырока выкарыстоўвалася новая арнаментыка (застаўкі, канцоўкі, ініцыялы) і буйныя фігурныя дрэварыты. Выдадзены «Евангелле вучыцельнае» (1569, якое ўключала творы візант., балг. і старажытнарускай пісьменнасці, у т.л. «Слова на ўшэсце» Кірылы Тураўскага) і «Псалтыр з Часаслоўцам» (1570). З.д. спыніла сваю дзейнасць у сувязі з ускладненнем грамадска-паліт. умоў пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай, а таксама з-за хваробы гетмана Хадкевіча. Заблудаўскія выданні неаднаразова перавыдаваліся Гарабурдам, *Мамонічамі*, друкарамі Святадухаўскага брацтва ў Вільні.

Літ.: Зернова А.С. Первопечатник Петр Тимофеев Мстиславец // Книга: Исслед. и материалы. М., 1964. Сб. 9; Исаевич Я.Д. Першодрукар Іван Федоров і виникнення друкарства на Україні. Львів, 1975. С. 42—47; Немировский Е.Л. Иван Федоров в Белоруссии. М., 1979; Голенченко Г.Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI — середине XVII в. Мн., 1989. *Г.Я.Галенчанка.*

ЗАБЛУ́ДАЎСКІ УСПЕ́НСКІ МАНАСТЫ́Р. Дзейнічаў у г. Заблудаў (цяпер Беластоцкае ваяв., Польшча) у 17—19 ст. Некат. гісторыкі лічаць, што манастыр існаваў ужо ў 1560—70-я г. ў час дзейнасці ў Заблудаве друкароў І.*Фёдарава* і П.*Мсціслаўца* (Свята-Успенская царква ў Заблудаве засн. ў 1563). Упершыню ўпамінаецца ў фундушавым запісе 1659 уладальніцы Заблудава кн. Марыі Малдаванскай, удавы Я.Радзівіла. З запісу вынікае, што манастыр засн. да смерці Радзівіла (1655). У 1664—88 манастыром спрабавалі завалодаць уніяты, але намаганнямі дачкі і ўнучкі Марыі ён застаўся праваслаўным. У 2-й пал. 17 ст. пры манастыры дзейнічалі школа, шпіталь, б-ка. У 1746—55 тут захоўваліся мошчы св. Гаўрыіла Беластоцкага. У сярэдзіне 18 ст. манастыр заняпаў (у 1760 былі 4 манахі). Пасля наведання манастыра слуцкім архімандрытам Паўлам Ваўчанскім (1783) зроблены капітальны рамонт, аднавілі дзейнасць школа і шпіталь. З 1807 манастыр быў падпарадкаваны Мінскай епархіі, у 1824 скасаваны. *М.Р.Гайдук.*

ЗАБО́Й, 1) канец *горнай выработкі*, які паступова прасоўваецца ў выніку горных работ і з'яўляецца рабочым месцам гарняка. У шахтах і рудніках З. бываюць: гарызантальныя, вертыкальныя і нахіленыя; ачышчальныя, дзе непасрэдна здабываюць карысныя выкапні, і падрыхтоўчыя, або праходчыя. У кар'ерах (пры адкрытай распрацоўцы радовішча) З. — участак заходкі (рабочага ўступа і інш.), які непасрэдна распрацоўваецца экскаватарам. Паводле размяшчэння адрозніваюць З. бакавыя (тарцовыя) і франтальныя. 2) Тарцовая паверхня *буравой свідравіны*, якая пры праходцы разбураецца буравым інструментам.

ЗАБО́ЙСТВА, наўмыснае або неасцярожнае пазбаўленне жыцця чалавека. У крымін. праве Рэспублікі Беларусь адказнасць за З. настае з 14 гадоў. За наўмыснае З. пры абцяжваючых акалічнасцях (з карыслівымі матывамі, пры выкананні пацярпелым службовага або грамадскага абавязку, цяжарнай жанчыны, учыненае асабліва небяспечным рэцыдывістам ці асобай, якая раней была асуджана за наўмыснае З., і інш.) закон прадугледжвае доўгатэрміновае або пажыццёвае пазбаўленне волі або пакаранне смерцю. Законам прадугледжана крымін. адказнасць за З., учыненае ў стане моцнага душэўнага хвалявання, выкліканага неправамернымі паводзінамі пацярпелага, пры перавышэнні межаў неабходнай абароны і па неасцярожнасці, пазбаўленнем волі да 5 гадоў або папраўчыя работы на тэрмін да 2 гадоў. *Г.А.Маслыка.*

ЗАБО́РАЎ Барыс Абрамавіч (н. 16.10.1935, Мінск), бел. мастак. Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1954), Маскоўскі маст. ін-т імя В. Сурыкава (1961). Працуе ў станковым жывапісе, графіцы, скульптуры, тэатр.-дэкарацыйным мастацтве. У 1962—80 працаваў у Мінску. Сярод работ: ілюстрацыі да твораў У. Шэкспіра, А. Пушкіна, Ф. Дастаеўскага (залаты медаль у Дрэздэне 1971), А. Уайльда, Р. Барадуліна; жывапісныя творы «Сазопальскія рыбакі», серыя «Стары Талін» (усе 1965), «Палескія музыкі» (1966); дэкарацыі і касцюмы да спектакляў «Тысяча франкаў узнагароды» (1962) В. Гюго, «Мой нясчасны Марат» (1965) А.Арбузава, «На-

вальніца» (1976) А. Астроўскага — усе для Нац. акад. т-ра імя Я. Купалы. З 1980 у Парыжы. Творчай манеры ўласцівы інтэрпрэтацыя старой фатаграфіі як вобраза мінулага свету, складаная вобразная сістэма, настальгічнасць, выкарыстанне тэхнікі жывапісу па ляўкасе: «Пейзаж з лодкай» (1983), «Вясковая хата» (1986), «Нацюрморт з вазай» (1988), «Дыялог» і «Аголеная ў садзе» (абедзве 1989), «Дзяўчынка і манекены» (1992). Аўтар касцюмаў да спектакляў «Маскарад» (1922) М. Лермантава, «Лукрэцыя Борджыа» (1994) В. Гюго, «Месяц у вёсцы» (1966) І. Тургенева — усе для тэатра «Камеды Франсэз» (Парыж). *І.М.Мятліцкая, А.А.Сурскі.*

ЗАБО́Р'Е, вёска ў Расонскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 37 км ад г. п. Расоны, 190 км ад Віцебска, 32 км ад чыг. ст. Дрэтунь. 532 ж., 197 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму.

ЗАБО́РСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну, састаўная частка *Расонскага патрыятычнага падполля.* Дзейнічала ў жн. 1941 — крас. 1942 (кіраўнік У.В.Петрачэнка) на тэр. Віцебскай вобл. Мела 3 групы (23 чал.): у вёсках Аўсюкова і Забор'е (А.Дз.Цітоў, І.Ф.Лапатка), Лакці і Пакоціна (Я.А.Каган, А.І. і Н.І.Папляцеевы), Баканіха і Шарстова (М.Ф.Максіменка). Падпольшчыкі дзейнічалі ў кантакце з партызанамі, збіралі для іх зброю, разведданыя, харчаванне, медыкаменты. Разам з партызанамі ўдзельнічалі ў падрыве моста цераз р. Дрыса, 6 мастоў на шашэйных дарогах, спалілі будынак ням. камендатуры ў в. Забор'е, здзейснілі шэраг дыверсій па знішчэнні баявой тэхнікі, аўтатранспарту і жывой сілы ворага. Вясной і летам 1942 амаль усе падпольшчыкі пайшлі ў партызаны. Дзейнасць падполля ўвекавечана ў Музеі баявой садружнасці бел., рус., латв. і літ. партызан у г.п. Расоны.

ЗАБО́РСКІ Георгій Уладзіміравіч (н. 11.11.1909, Мінск), бел. архітэктар. Засл. будаўнік Беларусі (1961), нар. архітэктар СССР (1981). Акад. Рас. акадэміі архітэктуры і буд. навук (1995). Скончыў Ленінградскую АМ (1939). У 1952—64 выкладчык БПІ (дацэнт з 1954). Працаваў у ін-тах «Белдзяржпраект», «Мінскпраект», з 1964 у БелНДІдзіпрасельбудзе (у 1966—79 кіраўнік майстэрні). Асн. работы ў Мінску: корпус Лечсануправлення (1948), ансамбль жылых дамоў на вул. Леніна (1949—56), карпусы пед. ун-та (1951—59), гасцініца Бел. саюза мастакоў, Літ. музей Я.Коласа (абедзве 1952), рэканструкцыя будынка суворaўскага вучылішча (1953), аэравакзал «Мінск-1» (1957), музей гісторыі Вял. Айч. вайны (1967), кінатэатр «Піянер», т-р лялек (абедзве 1964). Сааўтар генплана Полацка (1949). Сярод работ у сельскім буд-ве: сааўтар планіроўкі і забудовы вёсак *Верцялішкі* (Дзярж. прэмія СССР 1971), Сарачы і Рэдкавічы Любанскага р-на (1969), аўтар Палаца культуры, гандл. цэнтра з гасцініцай, жылых дамоў у в. *Сноў* (1970-я г.) і інш. Творы манум. мастацтва: *Манумент Перамогі*, помнік Я.Коласу (1972) у Мінску, мемар. комплекс *Зыслаў.*

ЗАБО́РСКІ Пётр Іванаў (?—1665), майстар-цаніннік, чаканшчык і ювелір. Паходзіў з Беларусі. У 1658—65 узначальваў арцель бел. майстроў (І.*Максімаў*, С.*Палубес*, Ф.Чука і інш.), якія стварылі вонкавае ўбранства і аздабленне інтэр'ера Васкрасенскага сабора Нова-Іерусалімскага манастыра (каля г. Істра Маскоўскай вобл.) шматкаляровымі паліванымі кафлямі.

«ЗАБРО́ДДЗЕ», каменны метэарыт, які ўпаў у 1893 каля в. Забродзе Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. Маса 3155 г. Належыць да хандрытаў. Асн. частка метэарыта зберагаецца ў музеі Віленскага ун-та, 195 г — у калекцыі Адэскага ун-та, 3 г — у Брытанскім музеі. Муляж метэарыта знаходзіцца ў Ін-це геал. навук Нац. АН Беларусі. Гл. таксама *Метэарыты.*

Літ.: Бордон В.Е., Давыдов М.Н. Рожденные в космосе. Мн., 1982. С. 37—38.

У.Я.Бардон.

ЗАБРО́ДСКІ Сяргей Сцяпанавіч (17.12.1911, г. Нясвіж, Мінскай вобл. — 7.1.1980), бел. вучоны ў галіне гідрадынамікі і цепла- і масаабмену. Чл.-кар. АН БССР (1966), д-р тэхн. н. (1960), праф. (1964). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1978). Скончыў БПІ (1939). З 1946 навук. супрацоўнік Энергасектара, потым Ін-та энергетыкі АН БССР, з 1957 заг. лабараторыі Ін-та цепла- і масаабмену АН БССР. Навук. працы па даследаванні цепла- і масаабмену ў дысперсных сістэмах. Прапанаваў формулу для разліку каэф. цеплаабмену ў кіпячым слоі, распрацаваў асновы выкарыстання дысперсных матэрыялаў і інш.

Г.У.**Заборскі**.

С.С.**Забродскі**.

Літ.: Гидродинамика и теплообмен в псевдоожиженном (кипящем) слое. М.;Л., 1963; Высокотемпературные установки с псевдоожиженным слоем. М., 1971.

ЗАБРУ́ДЖВАЛЬНІКІ, прыродныя (натуральныя) і антрапагенныя агенты (фіз. фактары, хім. рэчывы, біял. віды — пераважна мікраарганізмы і інш.), якія трапілі ў навакольнае асяроддзе або ўзніклі ў ім у колькасцях, што перавышаюць звычайныя, граничныя ваганні ці сярэдні прыродны фон за вызначаны час (гл. *Забруджванне навакольнага асяроддзя*). Існуюць З. атмасферы, вод, глеб (гл. ў арт. *Забруджванне атмасферы, Забруджванне вод, Забруджванне глеб*). Адрозніваюць першасныя З., што непасрэдна ўтвараюцца ў натуральных, прыродна-антрапагенных і антрапагенных працэсах, і другасныя, якія выяўляюцца ў працэсе мадыфікацыі, распаду або пад уздзеяннем першасных. Асобныя агенты, што атрымліваюцца пры ўтварэнні небяспечных З. у фіз.-хім. працэсах, якія адбываюцца непасрэдна ў асяроддзі, могуць быць у месцах вытв-сці і выкарыстання няшкоднымі, але становяцца небяспечнымі пры іх міграцыі ў інш. геасферы (напр., фрэоны, хімічныя інертныя каля паверхні Зямлі, у стратасферы ўдзельнічаюць у фотахім. рэакцыях з утварэннем іона хлору, які з'яўляецца каталізатарам пры разбурэнні азонавага слоя планеты). *Я.В.Малашэвіч.*

Б.**Заборaў**. Аголеная ў садзе. 1989.

ЗАБРУ́ДЖВАННЕ АНТРАПАГЕ́ННАЕ, забруджванне, якое выклікаецца гасп. дзейнасцю чалавека (гл. *Забруджванне навакольнага асяроддзя)*. Гасп. дзейнасць людзей (прама ці ўскосна) вядзе да ўзнікнення шкодных для навакольнага асяроддзя фіз., хім., біял., інфарм. агентаў і павелічэння іх канцэнтрацый (гл. *Забруджванне атмасферы, Забруджванне вод, Забруджванне глеб*). Найб. катастрафічныя З.а. звязаны з ваеннай, хім., паліўнай прам-сцю. Узровень З.а. кантралюецца прынятымі нарматывамі — ГДК, ГДВ і інш.

ЗАБРУ́ДЖВАННЕ АТМАСФЕ́РЫ, працэс змены складу атмасферы ў выніку паступлення ў яе *забруджвальнікаў* (аэразолей, газаў, цвёрдых часцінак і інш.). Негатыўна ўздзейнічае на жывыя арганізмы, прыносіць шкоду матэрыяльным каштоўнасцям. Адрозніваюць прыроднае (натуральнае) З.а. і *забруджванне антрапагеннае*. Крыніцы натуральнага З.а. — касмічны пыл, дзейнасць вулканаў, ветравая эрозія глебы, выветрыванне горных парод, зрэдку масавае цвіценне раслін і інш. У атмасферы дамешкі размяркоўваюцца нераўнамерна, у залежнасці ад размяшчэння крыніц забруджвання, метэаралагічных, тапаграфічных і інш. фактараў; маюць значэнне і мясц. атм. працэсы і *трансгранічны пераносе* забруджвальнікаў. Антрапагеннае З.а. абумоўлена інтэнсіўнымі выкідамі і фіз. ўздзеяннямі на атмасферу розных галін гасп. дзейнасці чалавека; асн. забруджвальнікі: аксіды азоту, серы, вугляроду і інш. газападобныя злучэнні, пыл, аэразолі, вуглевадароды. Штогод у атмасферу выкідваецца каля 20 млрд. т вуглякіслага газу CO_2, 700 млн. т інш. злучэнняў; тэхнагеннае паступленне CO_2 складае каля 150 млн. т.

Канцэнтрацыя забруджвальнікаў паветра ў гарадах большая, чым у аддаленых населеных месцах. Непасрэдна з З.а. звязана ўзнікненне *смогу* ў буйных гарадах. Да асн. крытэрыяў якасці паветра належаць гранічна дапушчальныя канцэнтрацыі для населеных месцаў (стандарты якасці паветра). Для аздараўлення павет. басейна ўдасканальваюць тэхналогіі вытв. працэсаў, спосабы газаачысткі, пыла- і попелаўлоўнікаў, герметызацыю абсталявання, удасканальваюць спосабы спальвання паліва, цвёрдае і вадкае паліва замяняюць прыродным газам, ствараюць больш дасканалыя трансп. рухавікі і інш. Барацьба з З.а. — вядучая задача *аховы атмасферы*.

Я.В.Малашэвіч.

ЗАБРУ́ДЖВАННЕ ВОД, працэс змены складу і ўласцівасцей вады, абумоўлены паступленнем у водныя аб'екты *забруджвальнікаў*, якія робяць воды непрыдатнымі для водакарыстання, пагаршаюць умовы пражывання жывых арганізмаў. Адрозніваюць прыроднае (натуральнае) З.в. і *забруджванне антрапагеннае*. Прыроднае З.в. выклікаецца паводкамі, размывам берагоў, забруджанымі атм. ападкамі, рэчывамі, што вымываюцца з глебы. Некат. газападобныя рэчывы выкідваюцца ў атмасферу, а потым з ападкамі трапляюць у водныя аб'екты. Антрапагеннае З.в. абумоўлена паступленнем у водныя аб'екты прадуктаў, што выкідваюцца ў асяроддзе ў выніку бытавой, с.-г., прамысл. і інш. гасп. дзейнасці чалавека. Асн. крыніцы такога З.в.: воды сцёкавыя шахтаў, руднікоў, нафтапромыслаў, адходы хім. прам-сці, драўніны пры яе нарыхтоўцы, апрацоўцы і сплаве, апрацоўкі некат. с.-г. тэхн. культур, скіды воднага і чыг. транспарту і інш. Выключаюць З.в. біял. (мікраарганізмы і здольныя да браджэння арган. рэчывы), хім. (таксічныя або рэчывы, якія змяняюць склад воднага асяроддзя), фіз. (награванне, радыеактыўнасць і інш.).

Першасныя змены З.в. узнікаюць ад непасрэднага ўздзеяння забруджвальнікаў на водныя аб'екты і ўплываюць на фіз.-хім. і біял. якасці вады, яе склад, т-ру, газавы рэжым і інш. ўмовы пражывання гідрабіёнтаў. У выніку другасных змен (пры ўзаемадзеянні забруджвальных рэчываў паміж сабой, з вадой ці інш. прыроднымі рэчывамі) утвараюцца новыя рэчывы, якія адмоўна ўплываюць на водныя арганізмы, узмацняюць або аслабляюць працяканне біяхім. працэсаў, змяняюць працэсы самаачышчэння і мінералізацыі вады і інш. Вынік — пагаршэнне гідрахім. рэжыму і ўмоў пражывання водных арганізмаў, немагчымасць выкарыстання вады для пітных, культурна-бытавых мэт, тэхн. водазабеспячэння. Трацічныя змены парушаюць складаны комплекс узаемасувязей гідрабіёнтаў з навакольным асяроддзем і ўзаемаадносіны паміж арганізмамі вадаёма, агульны жыццёвы цыкл іх развіцця. Назіраецца распад біяцэнозаў, паніжаецца біял. прадукцыйнасць вадаёмаў, знішчаюцца рыбныя запасы. Штогадовы знос з сушы ў воднае асяроддзе рэчываў пад уздзеяннем антрапагенных фактараў ацэньваецца ў 50 млрд. т.

На Беларусі ў рэкі скідваецца некалькі кубічных кіламетраў сцёкаў за год (найб. аб'ём забруджвальнікаў даюць нафтахім. і харч. прам-сць, электраэнергетыка), што вядзе да забруджвання вод нітратамі, засалення адходамі калійнай вытв-сці. Найб. аб'ёмы сцёкаў паступаюць у бас. рэк Зах. Дзвіна і Бярэзіна (бас. Дняпра). Гал. задача *аховы водаў* — папярэджанне З.в. і ліквідацыя яго крыніц.

Я.В.Малашэвіч.

ЗАБРУ́ДЖВАННЕ ГЛЕБ, працэс насычэння глебы *забруджвальнікамі* ў колькасцях і канцэнтрацыях, якія перавышаюць здольнасць глебавых экасістэм да іх уключэння ў біял. кругаварот. Адрозніваюць прыроднае (натуральнае) З.г. і *забруджванне антрапагеннае*. Прыроднае выклікаецца стыхійнымі сіламі і мае рэгіянальны або лакальны характар (напр., у выніку рассейвання вулканічнага попелу, пры пылавых бурах, паводках і інш.). Найб. пашырана антрапагеннае З.г., выкліканае гасп. дзейнасцю чалавека.

Асн. забруджвальнікі глебы — патагенныя мікраарганізмы (узбуджальнікі сібірскай язвы, батулізму, дызентэрыі, тыфу і інш.), металы (жалеза, медзь, цынк, ртуць і інш.) і іх злучэнні, сродкі хімізацыі сельскай гаспадаркі (гербіцыды, пестыцыды, мінер. ўгнаенні), радыеактыўныя элементы, дэтэргенты, дэфаліянты, нафтапрадукты і інш. Паступленне забруджвальнікаў у глебу з быт. адходамі, выкідамі прам-сці, транспарту, сельскай гаспадаркі мяняе ход глебаўтваральнага працэсу (часцей у бок тармажэння), уплывае на фіз.-хім. ўласцівасці глебы, здольнасць яе да самаачышчэння, вядзе да назапашвання забруджвальнікаў у раслінах: небяспечныя хім. элементы і прадукты іх пераўтварэння могуць трапляць у арганізм жывёл і чалавека. Большая ч. ўсіх адходаў акумуліруецца ў паверхневым (3—5 см) пласце глебы, больш за ўсё шкодных рэчываў намнажаецца ў паніжаных месцах, на ўзгорыстых і горных мясцінах, у поймах рэк таксічных рэчываў застаецца менш (вымываюцца патокамі вады). Маштабы З.г. у наш час набылі глабальны характар: тэхнагеннае паступленне жалеза на паверхню Зямлі перавышае натуральнае больш як у 10 разоў, медзі ў 26, цынку ў 15; для аховы ўраджаю с.-г. культур выкарыстоўваецца больш за 900 хім. злучэнняў; штогод у свеце назапашваецца каля 20 млрд. т аргана-мінер. і мінер. адходаў, з мінер. ўгнаеннямі на палі ў глебу ўносіцца каля 60 млн. т азоту, фосфару і калію, каля 4—5 млн. т пестыцыдаў.

На Беларусі найб. колькасць вытв. забруджванняў прыпадае на прадпрыемствы хім. прам-сці. У глебавым покрыве вакол гарадоў Гомель, Гродна, Магілёў, Мазыр, Наваполацк адзначаны павышаныя колькасці сярністага ангідрыду, вокіслаў вугляроду, азоту, цяжкіх металаў. У р-не г. Салігорск назіраецца засаленне глебы адходамі калійнай вытв-сці. Папярэджанне З.г. — адна з асн. задач *аховы глебаў*.

Я.В.Малашэвіч.

ЗАБРУ́ДЖВАННЕ НАВАКО́ЛЬНАГА АСЯРО́ДДЗЯ, паступленне ў асяроддзе рэчываў, біял. агентаў або розных відаў энергіі ў колькасці, якая перавышае звычайны ўзровень. Аказвае шкодны ўплыў на існаванне жывых арганізмаў і парушае прыродную дынамічную раўнавагу. Вылучаюць прыроднае і *забруджванне антрапагеннае*, з якімі звязаны *забруджванне атмасферы, забруджванне вод, забруджванне глеб*. Прыроднае забруджванне звязана з натуральнымі працэсамі (напр., у выніку вулканічнай дзейнасці); бывае часовае, пастаяннае, лакальнае, рэгіянальнае і глабальнае. Рост *антрапагеннага ўздзеяння* на навакольнае асяроддзе — эканам., сац., паліт. і прыродазнаўча-навук. праблемы. Барацьба з З.н.а. патрабуе заканадаўчага забеспячэння, кантролю велічынь гранічна дапушчальных канцэнтрацый шкодных рэчываў, грунтуецца на пастаянным павышэнні агульнай, тэхнал., экалагічнай культуры насельніцтва, стварэнні экалагічна бяспечных сістэм гасп. дзейнасці, узвядзенні ачышчальных збудаванняў і інш. (гл. таксама *Ахова прыроды, Экалогія*). На Беларусі на 1.1.1996 намнажэнне адходаў складала 619 млн. т, за год утвараецца да 20 млн. т (у прам-сці да 80%, у быт. сектары да 20%). Гал. доўгатэрміновай экалагічнай праблемай з'яўляецца радыеактыўнае З.н.а. пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у 1986, якая ахапіла каля 23% тэр. рэспублікі (па цэзіі-137).

Літ: Будыко М.И. Глобальная экология. М., 1977; Радкевич В.А. Экология. 3 изд. Мн., 1997.

В.М.Бурак.

ЗАБРЭ́ЗЗЕ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і кал-

гаса. За 12 км на Пн ад горада і 5 км ад чыг. ст. Валожын, 87 км ад Мінска. 423 ж., 180 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — царква (1867). Каля вёскі *Забрэзскі валун*.

ЗАБРЭ́ЗСКІ ВАЛУ́Н, геалагічны помнік прыроды ў Беларусі, каля аўтадарогі Мінск—Ашмяны. За 2 км на Пд ад в. Забрэззе Валожынскага р-на Мінскай вобл. Вялікі ледавіковы валун ружаваташэрага сярэднезярністага мігматыту. Даўж. 4,6 м, шыр. 3,6 м, вышэ. 1,7 м, у абводзе 12,8 м, аб'ём 15 м^3, маса каля 40 т. Прынесены ледавіком каля 200—120 тыс. г. назад з паўд. Карэліі. На паверхні З.в. захавалася вял. паглыбленне (50—70 см у папярочніку, да 10 см глыбіні). *В.Ф.Вінакураў.*

ЗАБРЭ́ЙКА Пётр Пятровіч (н. 3.2.1939, г. Варонеж, Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1968), праф. (1970). Скончыў Варонежскі ун-т (1961). Працаваў у Варонежскім і Яраслаўскім ун-тах, Ін-це тэхн. кібернетыкі АН СССР. З 1981 у БДУ. Навук. працы па нелінейным функцыянальным аналізе, набліжаных метадах, дыферэнцыяльных і інтэгральных ураўненнях. Распрацаваў тэорыю інтэгральных аператараў у шырокім класе прасторaў. Адзін з аўтараў даведнікаў «Інтэгральныя ўраўненні» (1968), «Функцыянальны аналіз» (1972).

Тв.: Геометрические методы нелинейного анализа. М., 1975 (разам з М.А.Краснасельскім).

Літ.: П.П. Забрейко // Вестн. БГУ. Сер. 1. 1989. № 2. *П.М.Бараноўскі.*

ЗАБЫЧА́ННЕ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Жадунька. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 19 км на ПдЗ ад г. Касцюковічы, 120 км ад Магілёва, 15 км ад чыг. ст. Камунары. 442 ж., 175 двароў (1997).

Упершыню ўпамінаецца ў 1552 як сяло ў Крычаўскай воласці, дзярж. маёмасць. Сялянe вёскі ўдзельнічалі ў *Крычаўскім паўстанні 1743—44.* У 1747 у Крычаўскім старостве: 10 двароў, царква. Пасля 1772 у Рас. імперыі. У 1779 у Чэрыкаўскім пав., 208 ж., 47 двароў. У 1880 — 276 ж.. У 1909 — 322 ж., 3 разы ў год праводзіліся кірмашы. З 1924 у Касцюковіцкім р-не. У 1971 — 415 ж., 123 двары.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — царква (канец 19 — пач. 20 ст.).

ЗАБЭ́ЙДА-СУМІ́ЦКІ Міхаіл Іванавіч (14.6.1900, в. Шэйпічы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. — 21.12.1981), бел. спявак (лірычны тэнар). Скончыў Маладзечанскую семінарыю (1918, на той час пераведзена ў Смаленск). Вакальную падрыхтоўку атрымаў у Харбіне (1920—22). У 1929—32 у Харбінскай оперы, у 1932—34 у Мілане, удасканальваўся ў Ф.Карпі, канцэртаваў у Міланскай кансерваторыі. У 1935—36 у Пазнанскай оперы (Польшча), з 1937 саліст Варшаўскага радыё, з 1940 саліст Нар. т-ра ў Празе, пазней канцэртны спявак. Адзін з яркіх прадстаўнікоў еўрап. вак. школы. Меў гнуткі, прыгожага тэмбру голас, яркую сцэн. знешнасць, акцёрскі талент; спяваў заўсёды на мове арыгінала. Сярод партый: Сінадал («Дэман» А.Рубінштэйна), Ленскі («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Альфрэд, Герцаг («Травіята», «Рыгалета» Дж.Вердзі), граф Альмавіва («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Уладзімір («Князь Ігар» А.Барадзіна), Пінкертон, Рудольф («Мадам Батэрфляй», «Багема» Дж.Пучыні). У канцэртным рэпертуары значнае месца займалі бел. нар. песні, творы бел. кампазітараў (М.Аладава, А.Багатырова, М.Чуркіна, Р.Пукста і інш.). Першыя грампласцінкі, якія наспяваў З.-С., уключалі бел. нар. песні («Маладыдубочак», «Чаму ж мне не пець», «Лявоніха» і інш.), у 1968 запісаў грампласцінку з бел. нар. песнямі. У гады 2-й сусв. вайны канцэртаваў у Ваўкавыску (1943), Вільні (1944) і інш. У 1963 канцэртаваў у розных гарадах Беларусі. На працягу многіх гадоў не парываў сувязі з Беларуссю, цікавіўся творчасцю бел. пісьменнікаў, быў асабіста знаёмы з М.Танкам, Р.Шырмам. Пераможца многіх конкурсаў вакалістаў. Архіў З.-С. захоўваецца ў Бел. дзярж. архіве-музеі л-ры і мастацтва.

М.І.**Забэйда-Суміцкі**.

М.**Забэйда-Суміцкі** ў ролях Ленскага (злева) і Герцага.

Тв.: Песня сталася маёю моваю // Мастацтва Беларусі. 1990. № 6—7.

Літ.: Станкевіч А. Міхаіл Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песня. Вільня, 1938; Плавінскі М. Салавей бацькаўшчыны мілай // Беларусь. 1990. № 2; Сачанка Б. Беларуская эміграцыя: Факты і меркаванні // Маладосць. 1988. № 10.

Л.Ф.Голікава.

ЗАБЯЛЫ́ШЫН (Забялышына), вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Хоцімск—Клімавічы. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 20 км на ПнЗ ад г.п. Хоцімск, 163 км ад Магілёва, 39 км ад чыг. ст. Клімавічы. 928 ж., 374 двары (1997). Спіртзавод, вінаробны цэх. Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, лазнева-пральны камбінат, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — царква Іаана Прадцечы (1843).

ЗАБЯНЬКО́Ў Ігар Іванавіч (н. 10.7.1940, г.п. Бягомль Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне радыётэхнікі. Канд. тэхн. н. (1979), праф. (1992). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1964). З 1964 у Бел. дзярж. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па тэорыі нелінейных інерцыйных радыёланцугоў, эл.-магн. сумяшчальнасці, лічбавых радыёпрыёмных прыладах, рухомай радыёсувязі.

Тв.: Расчет нелинейной передаточной характеристики усилителя с обратной связью // Весці АН БССР. Сер. фіз.-тэхн. навук. 1980. Вып. 3; Инфрадинный прием (у сааўт.) // Радиотехника. 1982. № 9.

ЗАБЯРЭ́ЗІНСКІЯ, дзяржаўныя дзеячы, герба «Ляліва» ў ВКЛ. Паходзілі са стараж. літоўскага баярства, роднасныя *Манівідавічам*, Гедыгольдавічам, *Аляхно-*

вічам, Дарагастайскім. У сярэдзіне 15 ст. баярын Юрый Рымавідавіч ад вял. кн. ВКЛ Казіміра атрымаў маёнтак Забярэззе ў Ашмянскім пав. (адсюль прозвішча роду). Найб. вядомыя:

Ян (каля 1440—2.2.1508), сын Юрыя, маршалак дворны ў 1486—92, намеснік полацкі ў 1490—96 і новагародскі ў 1496—98, кашталян у 1492—99 і ваявода ў 1498—1505 трокскі, маршалак земскі з 1498. Адзін з найбуйнейшых магнатаў у Беларусі. Забіты ў час *Глінскіх мяцяжу 1508*. Ян (каля 1480—1538), сын Яна Юр'евіча, намеснік ваўкавыскі і крычаўскі, маршалак дворны ў 1503—16, ваявода новагародскі ў 1509—31, староста драгічынскі ў 1514—16, маркаўскі ў 1518 і мерацкі ў 1520, маршалак земскі ў 1522—37, ваявода трокскі з 1531. Ян (мянушка Малодшы; каля 1510 — каля 1545), сын Яна Янавіча, маршалак дворны з 1529. Апошні з роду З., іх маёнткі перайшлі да *Заслаўскіх*, *Мсціслаўскіх*, Збаражскіх.

В.Л.Насевіч.

ЗА́ВАДЗЬ, невялікі заліў ракі з павольным, часта зваротным цячэннем. Утвараюцца на рэках, якія маюць малы нахіл, моцна меандруюць.



Падлогавая рэйкавая **завалачная машына**: 1 — мульда; 2 — мульдавая цялежка; 3 — цялежка машыны; 4 — мост.

ЗАВАДО́ЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч (26.11.1900, в. Пчалінаўка Варонежскай вобл., Расія — 29.1.1960), удзельнік вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў у Вял. Айч. вайну, ген.-лейт. (1944), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў курсы ўдасканалення вышэйшага камсаставу (1941), Вышэйшыя курсы пры Ваен. акадэміі Генштаба (1949). У Чырв. Арміі з 1918. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Калінінскім, Зах., 3-м Бел. франтах. Стралковы корпус пад камандаваннем З. вызначыўся ў чэрв. 1944 пры вызваленні Барысава, Оршы, Мінска, Літвы, у баях за Кёнігсберг. Пасля вайны ў Сав. Арміі.

ЗАВА́ДСКІ Уладзімір Георгіевіч (13.1.1919, г. Орша Віцебскай вобл. — 20.6.1992), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Энгельскае ваен. авіяц. вучылішча (1940), Харкаўскі інж.-эканам. ін-т (1976). У Чырв. Арміі з 1939. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Сцяпным, 2-м Укр. франтах у бамбардзіровачнай і разведвальнай авіяцыі. Удзельнік Маскоўскай, Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі. Зрабіў 152 баявыя вылеты. Да 1956 у Сав. Арміі.

ЗАВА́ДСКІ Юрый Аляксандравіч (12.7.1894, Масква — 5.4.1977), рускі рэжысёр, акцёр, педагог. Нар. арт. СССР (1948). Герой Сац. Працы (1973). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це. Творчую дзейнасць пачаў у 1915 у студыі Я.Вахтангава. У 1924—31 акцёр МХАТа. З 1924 кіраваў заснаванай ім студыяй. З 1940 гал. рэжысёр Маскоўскага т-ра імя Массавета і выкладчык у Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва (з 1947 праф.). Яго ігра вызначалася пластычнай вытанчанасцю, дакладнасцю сцэн. малюнка: Антоній («Цуд святога Антонія» М.Метэрлінка), Калаф («Прынцэса Турандот» К.Гоцы), Чацкі («Гора ад розуму» А.Грыбаедава). У пастаноўках гераікалірычных спектакляў, рамант. трагедый, камедый («Шынкарка» К.Гальдоні, «Атэла» У.Шэкспіра, «Маскарад» М.Лермантава) імкнуўся да сінтэзу розных тэатр. традыцый. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1951, 1965. Ленінская прэмія 1965.

ЗА́ВАЙЦЬ, вёска ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на З ад г. Нароўля, 190 км ад Гомеля, 20 км ад чыг. ст. Ельск. 447 ж., 187 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЗАВА́ЛАЧНАЯ МАШЫ́НА, машына для завалкі (загрузкі) у сталеплавільныя агрэгаты (печы) цвёрдай шыхты (стальны лом, чыгун, руда, флюсы). Бываюць падлогавыя рэйкавыя (выкарыстоўваюцца ў мартэнаўскіх цэхах з печамі ёмістасцю 150 т і болей), бязрэйкавыя (для печаў ёмістасцю 5—20 т) і падвесныя (для печаў 20—150 т). Падлогавыя З.м. — цялежкі з хобатам, які ўводзіць у завалачнае акно печы мульду з шыхтай; падвесныя — маставы кран з галоўнай (загрузачнай) і дапаможнай (кранавай, для рамонтных работ) цялежкамі.

ЗАВАЛО́ЧЫЦЫ, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл., на р. Пціч, каля аўтадарогі Бабруйск—Слуцк. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 38 км на Пн ад г.п. Глуск, 150 км ад Магілёва, 26 км ад чыг. ст. Старыя Дарогі. 713 ж., 310 двароў (1997). Спіртзавод. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ЗАВА́РЗІН Аляксей Аляксеевіч (25.3.1886, С.-Пецярбург — 25.7.1945), рускі гістолаг, стваральнік навук. школы, адзін з заснавальнікаў эвалюц. гістталогіі. Акад. АН СССР (1943) і АМН СССР (1944). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1907). З 1916 праф. Пермскага ун-та, з 1922 у Ваенна-мед. акадэміі, з 1944 дырэктар Ін-та цытталогіі, гісталогіі і эмбрыялогіі АН СССР. Навук. працы па параўнальнай гісталогіі нерв. сістэмы, крыві, злучальнай тканкі. Дзярж. прэмія СССР 1942.

А.М.**Заварыцкі**.

ЗАВАРО́Т КІ́ШАК, гл. *Непраходнасць кішэчніка*.

ЗАВАРЫ́ЗГІН Барыс Сяргеевіч (н. 11.3.1921, Масква), удзельнік вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў у Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945), ген.-м. авіяцыі (1975). Скончыў Чкалаўскую ваен. авіяц. школу (1942), акадэміі Ваенна-паветр. (1951) і Генштаба (1960). На фронце з 1943. Пам. камандзіра штурмавога авіяпалка ст. лейт. З. вызначыўся ў Бел. аперацыі 1944: удзельнік штурму абароны праціўніка на рубяжы Віцебск—Орша, вызвалення Мінска, ліквідацыі мінскага «катла». Да 1982 у Сав. Арміі.

ЗАВАРЫ́ЦКІ Аляксандр Мікалаевіч (14.3.1884, г. Уфа, Башкортастан — 23.7.1952), расійскі геолаг і петраграф. Акад. АН СССР (1939). Скончыў Пецярбургскі горны ін-т (1909). У 1939—41 дырэктар Ін-та геал. навук АН СССР. У 1944—52 арганізатар і дырэктар Лабараторыі вулканалогіі АН СССР. У 1946—49 акад.-сакратар аддз. геал.-геагр. навук АН СССР. Навук. працы па тэарэт. петраграфіі і геалогіі рудных радовішчаў. Вывучаў патухлыя вулканы Арменіі, стараж. вулканізм Урала, вулканы Камчацка-Курыльскай дугі. Распрацаваў навук. кірунак у петраграфіі — петрахімію. Яго імем наз. мінерал заварыцкіт. Ленінская прэмія 1958. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1946.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—4. М., 1956—63.

«ЗАВЕ́ЙНІЦА», бел. нар. танец, блізкі да *«Мяцеліцы»*. Муз. памер 2/4. Тэмп хуткі. Танцоры, нагнуўшыся, парамі прабягаюць пад ручніком, які трымае ў выглядзе аркі адна з пар. Аснова танца — слізготны рух «кроку-бегу» з імклівымі паваротамі і чаргаваннем пар, якія выбягаюць з-пад аркі направа і налева, што стварае ілюзію ўрагану, мяцеліцы.

ЗАВЕ́ЛЛЕ, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дахнарка, за 16 км на ПнЗ ад г. Полацк. Пл. 0,32 км^2, даўж. 1,3 км, найб. шыр. 420 м, даўж.

берагавой лініі 3,8 км. Пл. вадазбору 2,3 км². Схілы катлавіны выш. 2—5 м (на Пн да 10 м), на У і Пн параслі лесам і хмызняком, на З разараныя.

ЗАВЕ́СНА, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ловаць (цячэ праз возера), за 43 км на ПнУ ад г. Гарадок. Пл. 1,59 км², даўж. 1,9 км, найб. шыр. больш за 1 км, найб. глыб. 2,4 м, даўж. берагавой лініі 5,5 км. Пл. вадазбору 11,6 км². Схілы катлавіны выш. да 5 м, разараныя. Берагі нізкія, пясчаныя, параслі хмызняком. На З забалочаная пойма шыр. да 200 м, пад хмызняком. Дно плоскае, выслана пяскамі, апясчаненымі глеямі і сапрапелем. Зарастае.

ЗАВЕ́Я, гл. *Мяцеліца.*

«ЗАВІВА́ННЕ БАРАДЫ́», старадаўні земляробчы абрад у беларусаў і інш. славянскіх народаў. Жнеі пакідалі некалькі нязжатых каласоў, выполвалі ў гэтым месцы траву, надломлівалі сцябліны, скручвалі іх з кавалачкам хлеба з соллю і прыціскалі да зямлі. Паводле павер'я, заставаліся зімаваць у гэтых каласках *жыцень* і інш. збожжавыя духі, якія давалі жыццё сцяблінам, напаўнялі каласы зернем. Лічылася, што сіла з «барады» перадасца зямлі і забяспечыць добры ўраджай у наступным годзе.

ЗАВІЛЕ́ЙСКАЯ ЗЯМЛЯ́, Завілейская Літва, назва ў бел. летапісах 15—17 ст. тэрыторыі каля р. Вілія ў больш раннія часы. Дакладнае месцазнаходжанне не вызначана. У «Хроніцы літоўскай і жамойцкай» і Хроніцы Быхаўца гаворыцца, што жамойцкія князі рухаліся па З.з. з ПнЗ на Пд і ПдУ, гэта значыць па тэр. на Пд ад р. Вілія. У некат. месцах летапісаў гэта тэр. названа Завілейскай Літвой. У інш. летапісах пад З.з. разумелі правабярэжжа Віліі (на Пн ад яе).

ЗАВІЛЕ́ЙСКІ ПАВЕ́Т. Існаваў у 1791—93, 1795—1842 у Віленскім ваяв. ВКЛ, з 1795 у Віленскай, з 1797 у Літоўскай, з 1801 у Віленскай губ. Расіі. Цэнтр г. Паставы. У 1842 перайменаваны ў *Свянцянскі павет.*

ЗАВІРУ́ХА, гл. *Мяцеліца.*

ЗА́ВІСІ, тое, што *суспензіі.*

ЗАВІТНЕ́ВІЧ Уладзімір Зянонавіч (14.4.1853, в. Ліцвяны Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — сак. 1927), бел. археолаг, гісторык. Д-р царк. гісторыі (1897), праф. (1904). Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1875), Пецярбургскую духоўную акадэмію (1879). У 1879—83 выкладчык у Варшаўскім духоўным вучылішчы. З 1884 дацэнт, з 1899 экстраардынарны праф. Кіеўскай духоўнай акадэміі. У 1880—90-я г. ўваходзіў у групу бел. інтэлігенцыі, што гуртавалася вакол газ. «Минский листок»; член гіст. т-ва Нестара-летапісца, Маск. археал. і царк.-археўнага т-ваў, камісіі па зборы стараж. актаў і інш. Даследаваў каля 700 курганоў *дрыгавічоў* пераважна ў Бабруйскім, Мазырскім, Рэчыцкім пав., вызначыў межы іх рассялення і этнавызначальныя прадметы. Шэраг прац прысвяціў пытанням царк. гісторыі, дзейнасці першых славянафілаў і інш. У 1918 чытаў лекцыі на курсах беларусазнаўства ў Кіеве. Звесткі пра далейшую дзейнасць адсутнічаюць. *У.В.Ляхоўскі.*

ЗАВІТО́К, 1) суквецце, у якім спіральна закручана больш маладая частка з нераспушчанымі кветкамі. У З. ад гал. восі (галінкі), якая нясе адну кветку, ніжэй адыходзіць другая аднакветкавая вось, ад яе ў гэты ж бок — вось 3-га парадку і г.д. З. характэрны для сям. бурачнікавых (святаяннік, шчамяліца, жывакост). 2) Абароты спіралі ракавіны ў некат. беспазваночных жывёл (напр., у бруханогіх малюскаў).

ЗАВІТО́К АНЬЁЗІ, плоская алгебраічная крывая 3-га парадку. Ураўненне ў прамавугольных каардынатах $y=\frac{a^3}{x^2+a^2}$, дзе a — дыяметр утваральнай акружнасці з цэнтрам у пункце (0; a/2). Мае асімптоту — вось Ox; максімум дасягаецца ў пункце (0; a); плошча паміж крывой і асімптотай $S=\pi a^2$. Назва ад прозвішча італьян. матэматыка М.Аньезі, які вывучаў яе (1748).

ЗАВІ́ША Канстанцін Іванавіч (20.10.1904, г. Рагачоў Гомельскай вобл. — 28.2.1984), бел. жывапісец. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930). Працаваў пераважна ў жанрах пейзажа і нацюрморта. Творам характэрны лірычны настрой. Аўтар карцін: «Асенні матыў» (1937), «Стары Мінск» і «Мінскі дворык» (да 1940), «Дняпро» (1945), «Раніца ў вёсцы» (1956), «Астры» (1958), «Кветкі і Венера», «Старонка лясная» (абодва 1960), «Восень. Баяры» (1978). Сярод сюжэтна-тэматычных карцін: «Пасля работы» (1957), «Юныя рыбаловы» (1963), «Лесараспрацоўка. Першы рэйс» (1967) і інш.

ЗАВІ́ША Ян Казімір (1820, маёнтак Кухціны, цяпер пас. Першамайск Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 1887), бел. археолаг. Чл. Маскоўскага археал. т-ва. Скончыў Мінскую гімназію. Даследаваў гарадзішчы і курганы каля в. Чурылава (Міёрскі р-н), гарадзішчы і каменныя магілы каля воз. Свіцязь, стаянкі каменнага веку каля в. Валеўка (Навагрудскі р-н). Вывучаў пытанні засялення стараж. чалавекам берагоў Віліі, Дняпра, Нёмана, міграцыю і культ. сувязі славян. На міжнар. кангрэсах археолагаў у Венецыі (1871) і Будапешце (1876) выступіў па праблемах вывучэння каменнага веку, пачынальнік даследавання гэтай эпохі на тэр. Беларусі. Заснаваў і выдаваў «Wiadomosci archeologiczne» «Археалагічныя ведамасці»; 1873—82). *Г.А.Каханоўскі.*

ЗАВІШЧА́НСКАЕ ВО́ЗЕРА, Завішчоўскае возера, у Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Піна, за 18 км на ПдУ ад г. Іванава. Пл. 1,3 км², даўж. 1,7 км, найб. шыр. 1 км, найб. глыб. 10,7 м, даўж. берагавой лініі 4,4 км. Схілы катлавіны выш. да 2 м, пясчаныя, пад лесам і хмызняком. Берагі выш. да 1 м, месцамі забалочаныя. На ПнУ выцякае Завішчанскі канал.

ЗАВІ́ШЫ, дзяржаўныя дзеячы герба «Лебедзь» у ВКЛ. Магчыма, іх род з'яўляецца адным са шматлікіх адгалінаванняў літоўскага баярскага роду, які прыняў герб «Лебедзь» у час заключэння *Гарадзельскай уніі 1413.* Родапачынальнік Завіша ўпамінаецца ў 1443—86. Найб. вядомыя:

Мельхіёр (1525?—1592), маршалак гаспадарскі ў 1578—88, кашталян віцебскі з 1588. Ян (каля 1550—1626), падкаморы лідскі ў 1593—96, ваявода мсціслаўскі ў 1596—99, ваявода віцебскі і староста суражскі з 1599. Ян Мікалай (каля 1585—1647), кашталян віцебскі з 1626. Андрэй (каля 1557—1604), ваявода мінскі ў 1596—98, падскарбі земскі ВКЛ з 1598. Крыштоф (каля 1600—70), лоўчы ВКЛ у 1629—37, пісар вялікі ВКЛ у 1637—49, староста мінскі ў 1631—45 і браслаўскі з 1645, маршалак надворны ў 1649—54, маршалак вялікі ў 1654—69, кашталян віленскі з 1669. Крыштоф Станіслаў (20.4.1666—15.8.1721), староста чачэрскі з 1684, мінскі з 1685, ваявода мінскі з 1720. У мемуарах апісаў паліт. падзеі і шляхецкі побыт Рэчы Паспалітай. Ігнацы (каля 1690—16.8.1738), мечнік ВКЛ у 1730—34, падкаморы ВКЛ у 1734—36, маршалак надворны з 1736, староста мінскі, чачэрскі, хаславіцкі, сумілішскі і індурскі, ген.-маёр кавалерыі. Ян Казімір (1820—87), гл. *Завіша Я.К.* *В.Л.Насевіч.*

ЗАВО́Д, 1) прамысл. прадпрыемства; у палітэканоміі тое, што *фабрыка.* Першапачаткова розніца паміж імі была ў характары апрацоўкі: механічная — на заводах, хімічная — на ф-ках. З развіццём навукі і тэхнікі на З. і на ф-ках выкарыстоўваецца мех. і хім. апрацоўка. Але па традыцыі адны прамысл. прадпрыемствы, пераважна машынабудавання і металаапрацоўкі, называюць З., другія, у асноўным лёгкай прамысловасці, — ф-камі. 2) Прадпрыемствы па гадоўлі пародзістай жывёлы.

ЗАВО́Д-АЎТАМА́Т, вытворчы комплекс, які аб'ядноўвае гібкія аўтаматызаваныя цэхі загатовачнай вытв-сці, апрацоўчыя і зборачныя цэхі, аўтаматызаваныя склады матэрыялаў, загатовак, камплектуючых вырабаў з дапамогай транспартна-накапляльнай сістэмы і *аўтаматызаванай сістэмы кіравання* (АСК) вытв-сцю; вышэйшая форма *гібкай аўтаматызаванай вытворчасці.* Забяспечвае выпуск шырокай наменклатуры аднародных па канструкцыйных і тэхнал. параметрах вырабаў і безынерцыйны пераход на выпуск новай прадукцыі за кошт комплекснай аўтаматызацыі ўсіх асн. і дапаможных тэхнал. аперацый, праграмнай пераналадкі абсталявання, сістэм аўтаматызаванага праектавання (САПР) і кіравання вытв.-тэхнал. працэсамі.

Узаемадзеянне структурных элементаў З.-а. ажыццяўляецца сродкамі інтэграванай сістэмы кіравання на базе лакальнай вылічальнай сеткі, якая рэалізуе сумеснае выкананне функцый тэхн. і арганізац.-эканам. падрыхтоўкі вытв-сці, яе планаванне, аператыўнае кіраванне на базе інтэграцыі САПР, АСК міжцэхавага ўзроўню, АСК *гібкімі вытворчымі модулямі*, гібкімі аўтам. лініямі, участкамі, цэхамі, заводскімі складамі, *робататэхнічнымі комплексамі* і асобнымі адзінкамі спец. тэхнал. абсталявання. Інфарм. забеспячэнне структурных элементаў АСК З.-а. ўключае сродкі абмену канструктарска-тэхнал., планавай, справаздачнай і нарматыўна-даведачнай інфармацыяй, кіравальнымі праграмамі для станкоў з лікавым праграмным кіраваннем, данымі аб стане вытв-сці і абсталявання, камандамі і запытамі. Інтэграцыя структурных элементаў інтэграванай АСК З.-а. ажыццяўляецца сродкамі сістэмнага *інтэрфейса* на аснове адзінай інфарм. базы і уніфікаванага комплексу тэхн., праграмных сродкаў і пратаколаў абмену данымі. Шматузроўневы сістэмны інтэрфейс уключае сістэмныя інтэрфейсы заводскага, цэхавага ўзроўню, узроўню аўтаматызаваных участкаў і аўтам. ліній. У знешняе асяроддзе З.-а. ўваходзяць САПР, аўтаматыз. сістэмы навук. даследаванняў, што функцыянуюць у рамках *навукова-вытворчых аб'яднанняў*.

Г.В.Рымскі.

ЗАВО́ДСКАЯ СЛАБАДА́, вёска ў Магілёўскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 35 км на ПдЗ ад Магілёва, 4 км ад чыг. ст. Вендрыж. 592 ж., 203 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. ваеннапалонных і ахвяр фашызму.

Я.К.Завойскі.

ЗАВО́ЙСКІ Яўген Канстанцінавіч (28.9.1907, г. Магілёў-Падольскі, Украіна — 9.10.1976), савецкі фізік, заснавальнік казанскай навук. школы. Акад. АН СССР (1964; чл.-кар. 1953). Герой Сац. працы (1969). Скончыў Казанскі ун-т (1930). З 1947 у Ін-це атамнай энергіі АН СССР. Навук. працы па радыёспектраскапіі і фізіцы плазмы. Адкрыў электронны парамагнітны рэзананс (1944). Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны метад турбулентнага нагрэву плазмы. Прадказаў на магчымасць ажыццяўлення кіроўнага тэрмаядз. сінтэзу з дапамогай рэлятывісцкіх электронных пучкоў (1968). Ленінская прэмія 1957. Дзярж. прэмія СССР 1949.

ЗАВО́ЛЖА, тэрыторыя паміж р. Волга, Паўн. Уваламі, Уралам і Прыкаспійскай нізінай, у Расіі. Вылучаюць Высокае З. і Нізкае З. Высокае З. ўключае Верхнекамскае і Бугульмінска-Белебееўскае ўзв. (выш. да 418 м), Вяцкі Увал, Агульны Сырт. Складзена з пермскіх парод: пясчанікаў, сланцаў, глін, мергеляў, вапнякоў, даламітаў, гіпсу; на Пд з мезазойскіх глін і пяскоў. Рэльеф эразійны. Пашыраны карст. Нізкае З. (выш. да 125—150 м) — нізіннае левабярэжжа р. Волга на адрэзку ад г. Казань да г. Камышын, тэктанічны прагін, запоўнены кайназойскімі пясчана-гліністымі адкладамі стараж. Каспія. Ландшафты З. лясныя, лесастэпавыя і стэпавыя з кантынент. кліматам. Радовішчы нафты (гл. *Волга-Уральскі нафтагазаносны басейн*).

ЗАВО́ЧНАЕ НАВУЧА́ННЕ, форма арганізацыі навуч. працэсу для асоб, якія спалучаюць атрыманне адукацыі з прац. дзейнасцю; частка сістэмы бесперапыннай адукацыі. Прадугледжвае самаст. праходжанне навучэнцамі асобных раздзелаў навуч. курсаў у адпаведнасці з праграмамі і планамі, выкананне кантрольных заданняў і здачу экзаменаў у навуч. установе. Сістэма З.н. сфарміравалася і развілася на аснове завочных школ (груп), курсаў, завочных аддзяленняў вышэйшых і сярэдніх спец. навуч. устаноў. Выпускнікі завочных навуч. устаноў маюць тыя ж правы, што і выпускнікі дзённых і вячэрніх. З.н. ўзнікла ў 2-й пал. 19 ст. ў некат. краінах Зах. Еўропы і ЗША, калі былі створаны першыя прыватныя школы для З.н. замежным мовам. У канцы 1960-х г. з'явіліся дзярж. і прыватныя вышэйшыя і сярэднія спец. навуч. ўстановы, спецыялізаваныя на завочнай форме навучання. Ствараюцца міжнар. аб'яднанні (кансорцыумы) завочных навуч. устаноў. Запісы лекцый і інш. заняткаў транслююцца па навуч. сетках і з дапамогай спадарожнікавай сувязі камплектуюцца ў відэабібліятэкі. Пры ЮНЕСКА дзейнічае Міжнар. савет па З.н.

У Беларусі першыя завочныя аддзяленні створаны ў 1931 пры Віцебскім, Магілёўскім, Мінскім пед. ін-тах, у 1933 — пры Бел. політэхн. ін-це. У 1997/98 навуч. г. ў Беларусі пры агульнаадук. школах і *вячэрніх (зменных) агульнаадукацыйных школах* 168 груп завочнага навучання (больш за 3 тыс. навучэнцаў), у сярэдніх спец. навуч. установах 23,8 тыс. навучэнцаў-завочнікаў, у дзярж. ВНУ — 62,6 тыс., недзярж. — 17,5 тыс. студэнтаў-завочнікаў.

В.С.Болбас.

ЗАВУ́ЛІЧНЫ Яўген Рыгоравіч (н. 23.2.1937, в. Пшанаі Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне цеплафізікі і газадынамікі. Д-р тэхн. н. (1985), праф. (1991). Скончыў Маскоўскі энергет. ін-т (1960). У 1961—89 у Сібірскім аддзяленні АН СССР. З 1989 у Ін-це праблем энергетыкі АН Беларусі. Навук. працы па механіцы вадкасці, газу і плазмы, газадынаміцы і цепламасаабмене пры вонкавым і ўнутр. абцяканні цел рознай канфігурацыі, па ракетных рухавіках на цвёрдым паліве і ахаладжальна-награвальных сістэмах на сціснутым паветры. Дзярж. прэмія СССР 1984.

Тв.: Продольные вихревые структуры и теплообмен в области присоединения сверхзвукового турбулентного пограничного слоя (разам з В.М.Трафімавым) // Журн. прикладной механики и техн. физики. 1991. № 2.

ЗАВУ́ЦЦЕ, вёска ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., каля р. Авута, на аўтадарозе Дзісна — в. Лужкі. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 55 км на ПдУ ад Міёраў, 155 км ад Віцебска, 28 км ад чыг. ст. Зябкі. 401 ж., 145 двароў (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Капліца. Магіла ахвяр фашызму.

ЗАВЯДА́ННЕ РАСЛІ́Н, 1) фізіялагічны працэс, што выклікаецца нястачай вады ў органах раслін (гл. *Водны рэжым раслін*). 2) У фітапаталогіі — хвароба, якая характарызуецца панікласцю розных органаў раслін, што звязана са стратай тургару. Часта на лісці ўтвараюцца характэрныя плямы. Назіраецца пры пашкоджанні раслін або іх частак патагеннымі мікраарганізмамі пры мех. пашкоджанні каранёў, інтэнсіўным выпарэнні вады лісцем, лішку вады ў глебе і ўздзеянні інш. неспрыяльных фактараў.

ЗА́ВЯЗЬ, ніжняя, расшыраная частка песціка ў кветцы раслін, складаецца з аднаго ці некалькіх *пладалісцікаў*, мае *семязавязь* і дыферэнцыруецца ў плод. У залежнасці ад узаемаразмяшчэння З. і інш. частак кветкі адрозніваюць верхнюю (размяшчаецца свабодна на кветаложы, утворана толькі пладалісцікамі, напр., у люцікавых і злакаў), ніжнюю (цалкам абрастае тканкамі кветкавай трубкі або кветаложа, напр., у складанакветных, архідных, кактусавых) і прамежкавую (напр., у каменяломнікавых).

ЗАВЯШЧА́ННЕ, распараджэнне грамадзяніна адносна сваёй маёмасці на выпадак смерці, зробленае ў вызначаным законам парадку. У Рэспубліцы Беларусь кожны грамадзянін можа пакінуць па З. ўсю сваю маёмасць або частку яе адной або некалькім асобам, якія ўваходзяць ці не ўваходзяць у кола спадчыннікаў па законе, а таксама дзяржаве або пэўным арг-цыям. Завяшчальнік можа пазбавіць права на спадчыну аднаго, некалькіх або ўсіх спадчыннікаў па законе, за выключэннем асоб, якія маюць права на абавязковую долю. Завяшчальнік правамоцны ўскласці на спадчынніка выкананне якога-н. абавязацельства (т. зв. завяшчальны адказ) на карысць адной або некалькіх асоб.

ЗАГА́Д, 1) акт кіраўніка органа дзярж. кіравання або кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый. Паводле юрыд. прыроды можа быць *нарматыўным актам*, у якім змешчаны нормы права, што рэгулююць пэўныя грамадскія адносіны, і актам выкарыстання норм права. 2) Ва ўзбр. сілах пісьмовае або вуснае распараджэнне начальніка падначаленым, абавязковае для выканання. 3) Выканаўчы дакумент, на падставе якога выконваецца рашэнне гасп. суда.

ЗАГА́ДКА, іншасказальнае, вобразнае апісанне якога-небудзь прадмета або з'явы, якія трэба адгадаць; жанр *фальклору*. Узніклі ў старажытнасці. Змест іх складае ўся шматгранная рэчаіснасць: чалавек, яго дзейнасць, матэрыяльнае, сац. і духоўнае жыццё, прырода і яе з'явы, жывёльны і раслінны свет. З. вызначаецца прадметнасцю, канкрэтнасцю і рэалізмам, афарыстычнасцю і сцісласцю формы, трапнасцю, вобразнай мовай. Метафарычныя і алегарычныя З. аб прыродзе і яе з'явах найб. старадаўнія. З. можа заключаць у сабе метафару або мець формы кароткага апісання ці сціслага апавядання. Пашыраны ў народзе загадкі-пытанні і загадкі-задачы. Захаваўшы свае ранейшыя функцыі (выпрабаванне мудрасці, развіццё паэт. мыслення, кемлівасці, як забава і сродак пазнання свету ў вобразнай форме), З. бытуе і ў наш час, пераважна ў дзіцячым асяроддзі. Паэтычныя З. для дзяцей стварылі Р.Барадулін, В.Вітка, Н.Гілевіч, А.Клышка і інш. бел. пісьменнікі.

Публ.: Загадкі. /Скл. М.Я.Грынблат, А.І.Гурскі. Мн., 1972.; Беларускія загадкі/Укл. Я.Саламевіч. Мн., 1989.

Літ.: Карский Е.Ф. Белорусы. М., 1916. Т. 3, ч. 1. С. 406—417; Гілевіч Н.С. Паэтыка беларускіх загадак. Мн., 1976.

А.І.Гурскі.

ЗАГА́ЛЛЕ, балота на ПдУ Любанскага р-на Мінскай вобл., у вадазборы р. Арэса. Нізіннага тыпу. Пл. 9,2 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 6,9 тыс. га. Сярэдняя глыб. торфу 1,9 м. Асушаную ч. выкарыстоўваюць пад ворыва і сенажаць. На неасушаных землях месцамі рэдкі лес з хвоі і бярозы, пашырана асакова-гіпнавая раслінасць.

ЗАГА́ЛЬСКІ МАСЦЎ, балота ў Любанскім р-не Мінскай вобл. і Акцябрскім р-не Гомельскай вобл., у вадазборы р. Арэса. Нізіннага тыпу. На масіве 3 возеры, найб. Вячэра. Пл. 32,5 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 20,7 тыс. га. Сярэдняя глыб. торфу 1,8 м. Асушаная ч. выкарыстоўваецца пад ворыва і сенажаць. На неасушаных землях пераважае асакова-гіпнавая раслінасць.

ЗАГА́НЫ РАЗВІЦЦЯ, анамаліі развіцця, парушэнні ўнутрыутробнага развіцця, што прыводзяць да адхілення ў будове ці функцыях асобнага органа, сістэмы органаў або ўсяго арганізма. Вынік гаметапатыі (паталогія жан. яйцаклетак і сперматазоідаў), эмбрыяпатыі (паталогія эмбрыёна — перыяд развіцця ва ўлонні маці да 10—12 тыдняў) і фетапатыі (паталогія плода ва ўлонні маці ад 10—12 тыдняў да нараджэння). Могуць быць звязаны з ускладненай спадчыннасцю і шкодлівымі фактарамі знешняга асяроддзя (хваробы ці шкодныя прывычкі маці ў перыяд развіцця плода, фіз., хім., радыяцыйныя і інш. фактары, няправільнае харчаванне і інш.). Могуць быць вынікам камбінаванага ўздзеяння спадчынных і шкодных фактараў знешняга асяроддзя (мультыфактаральныя З.р.). Да З.р. адносяць прыроджаную адсутнасць якога-н. органа (аплазія, агенезія), яго зменшаны (гіпаплазія) ці павялічаны (макрасамія) памер, эктапію (размяшчэнне органа ў незвычайным месцы, напр., ныркі ў малым тазе), наяўнасць дабавачных органаў, зліццё паміж сабой органаў ці іх частак. Найчасцей бываюць З.р. апорна-рухальнага апарату (вывіхі, касалапасць і інш.), твару (расколіна верхняй губы), цвёрдага паднябення, унутр. органаў (парок сэрца, страўніка-кішачнага тракту і мочапалавой сістэмы). Назіраюцца таксама і ў жывёл.

І.У.Дуда.

ЗАГА́Р, змена колеру скуры ад утварэння ў яе паверхневым слоі пігменту меланіну. Бывае ад дзеяння ультрафіялетавых і інфрачырв. прамянёў сонца або штучных крыніц святла (ртутная кварцавая лямпа, эл. дуга і інш.). Дзеянне сонечных прамянёў у сярэдніх дозах выклікае лёгкі З., станоўча ўплывае на арганізм, паляпшае жыўленне скуры, павялічвае ў ёй колькасць вітаміну D., павышае супраціўляльнасць арганізма да інфекц. хвароб і інш. Доўга быць на сонцы супрацьпаказана старым людзям, дзецям да 2 гадоў, цяжарным, людзям з сардэчна-сасудзістымі хваробамі і інш.

ЗАГА́Р ПУСТЫ́ННЫ, карычнева-буры бліскучы налёт (або скарынка таўшч. 0,5—5 см) на паверхні горных парод (скал, абломкаў, галькі і інш.) у пустынях. Утвараецца ў выніку адкладаў вокісных спалучэнняў марганцу і жалеза з дамешкам гліназёму і крэменязёму ва ўмовах рэзкай змены т-ры горных парод з пераменным увільгатненнем. Ахоўвае пароды ад хуткага выветрывання.

Раўніна **Загароддзе** каля в. Крамно Драгічынскага раёна.

ЗАГАРО́ДДЗЕ, узвышаная раўніна на ПдЗ Беларусі ў Бярозаўскім, Драгічынскім, Іванаўскім, Кобрынскім, Пінскім р-нах Брэсцкай вобл.; фізіка-геагр. раён *Беларускага Палесся*. На Пн мяжуе з *Прыбугскай раўнінай*, на У і Пд — з *Прыпяцкім Палессем*, на З — з *Брэсцкім Палессем*. У субшыротным напрамку працягнулася на 85 км, з Пн на Пд — ад 15 да 35 км, пл. каля 2,2 тыс. км^2. Найвыш. пункт 179 м (каля в. Кротава). Адносныя перавышэнні над прылеглай азёрна-алювіяльнай раўнінай на Пн да 20—30 м.

У тэктанічных адносінах З. знаходзіцца на Палескай седлавіне і ўтворана ледавіковымі і водна-ледавіковымі адкладамі беларускага, бярэзінскага і дняпроўскага ледавікоў. У паўн. ч. З. вылучаюць краявы ледавіковы комплекс, у паўд. ч. — паніжаную, пераважна водна-ледавіковую раўніну. Паверхня паўн. ч. ўзгорыста-градавая, перасечаная, з абс. адзнакамі 140—170 м. Уздоўж правабярэжжа р. Ясельда працягнулася асіметрычная канцова-марэнная града (даўж. 70 км, найб. шыр. да 20 км) напорнага паходжання, з адорвенямі дантрапагенавых парод у ледавіковых адкладах і гляцыядыслакацыямі на паўн. схілах. На Пд ад яе спадзістахвалістая і плоская водна-ледавіковая раўніна (найб. выш. 140—155 м), уздоўж паўд. ускраіны якой пясчаныя дзюны, градыі ўзгоркі. Пашыраны пласкадонныя забалочаныя лагчыны. Карысныя выкапні: керамічная сыравіна, мел, торф, сілікатныя і буд. пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -5,2, ліп. 18,6 °С; ападкаў 573 мм; вегетац. перыяд 201 сут. Раўніна З. з'яўляецца ч. Балтыйска-Чарнаморскага водападзелу. Уздоўж паўн. і паўд. мяжы раўніны цякуць рэкі бас. Дняпра — Ясельда і Піна, на З — прытокі Зах. Буга. Па раўніне працякаюць невялікія, пераважна каналізаваныя, рэкі Стрымня, Самароўка, Піліпаўка, Мерачанка і інш. Глебы дзярнова-падзолістыя, дзярнова-аглееныя і тарфяна-балотныя. Пад лесам 25% тэр. Лясы ў асн. шыракалісты-хваёвыя і хваёвыя, засталіся невялікімі ўчасткамі. У зах. ч. З. захаваліся балоты і лугі. 30% тэр. пад ворывам.

ЗАГАРО́ДЫ ваенныя, штучныя перашкоды (збудаванні і разбурэнні), якія ствараюцца на шляхах руху праціўніка з мэтай нанесці яму ўрон, затрымаць і ўскладніць прасоўванне, скаваць манеўр або вымусіць перамяшчацца ў выгадным для нашых войск напрамку.

Падзяляюцца на наземныя (у т.л. водныя), марскія і паветраныя (процісамалётныя); выбуховыя (мінна-выбуховыя і ядзерна-мінныя), невыбуховыя і камбінаваныя; аператыўныя і тактычныя. Наземныя З. падзяляюцца на процітанкавыя (мінныя палі, равы, *эскарпы*, *контрэскарпы*, *надаўбні*, вожыкі і інш.), проціпяхотныя (змешаныя мінныя палі, драцяныя З. і інш.), процітранспартныя (мінна-выбуховыя З., завалы, *барыкады* і інш.). Марскія З. бываюць мінныя, сеткавыя, бонавыя (гл. *Боны*), камбінаваныя (у т.л. процідэсантныя); устанаўліваюцца на паверхні, у тоўшчы вады і на дне. Паветраныя З. — *аэрастаты* і інш. сродкі, якія пе-

рашкаджаюць палётам самалётаў і верталётаў, ускладняюць бомбакіданне. Гл. таксама *Фартыфікацыя*.

ЗАГАРТО́ЎВАННЕ АРГАНІ́ЗМА, павышэнне ўстойлівасці арганізма да ўздзеяння неспрыяльных фіз. фактараў навакольнага асяроддзя (нізкай і высокай т-р, паніжанага атм. ціску і інш.). Заснавана на здольнасці арганізма прыстасоўвацца да зменлівых умоў асяроддзя (гл. *Адаптацыя*). Набываецца шляхам сістэматычнага, шматразовага ўздзеяння фіз. фактараў на арганізм пры паступовым павышэнні іх дазіроўкі. Уздзеянне холадам павышае ўстойлівасць арганізма да нізкіх, а цяплом — да высокіх т-р. Адно з асноўных — З.а. да холаду, сутнасць якога ў паступовым нарастанні ступені ахаладжэння. У людзей, прыстасаваных да нізкіх т-р, цеплаўтварэнне ў арганізме больш інтэнсіўнае, што забяспечвае лепшае кровазабеспячэнне скуры, павышае ўстойлівасць да інфекц. захворванняў і абмаражэнняў. З.а. да холаду ажыццяўляюць пераважна частым знаходжаннем на вольным паветры (гл. *Аэратэрапія*) і выкарыстаннем водных працэдур (гл. *Водалячэнне*). Магчыма і адначасовае З.а. да цяпла і холаду (гл. *Лазня*). Для развіцця ўстойлівасці арганізма да паніжанага атм. ціску можна выкарыстоўваць узыходжанне ў горы (метад ступеньчатай *акліматызацыі*). Пры спыненні З.а. ступень загартаванасці слабее і праз 1—1,5 месяцы ўстойлівасць да фіз. фактараў знікае.

ЗАГАРТО́ЎКА, *тэрмічная апрацоўка* матэрыялаў, якая робіцца іх награваннем і наступным хуткім ахаладжэннем з мэтай фіксацыі (замацавання) высокатэмпературнага стану або прадухілення (падаўлення) непажаданых працэсаў, што адбываюцца пры павольным ахаладжэнні. З. магчыма толькі для рэчываў, раўнаважны стан якіх пры высокай т-ры адрозніваецца ад раўнаважнага стану пры нізкай т-ры (крышт. структурай, канцэнтрацыяй, дэфектнасцю). У выніку З. ствараецца адносна ўстойлівы (метастабільны) стан, які пры награванні пераходзіць у больш стабільны. З. апрацоўваюць металы, іх сплавы, шкло і інш.

Найб. пашырана З. сталі. Награваннем вышэй за крытычную т-ру сталь пераводзіцца ў стан аўстэніту — цвёрдага раствору вугляроду і легіравальных элементаў у гама-жалезе, што дазваляе растварыць у аўстэніце карбіды і рэалізаваць уплыў легіравальных элементаў і вугляроду на ўласцівасці сталі. Пры ахаладжэнні з пэўнай скорасцю падаўляецца распад аўстэніту на ферытна-карбідную сумесь і адбываецца бездыфузійнае (зрухавае) пераўтварэнне аўстэніту ў *мартэнсіт*. Пры гэтым рэзка павялічваецца цвёрдасць, трываласць, магн. насычэнне і зніжаецца пластычнасць сталі. Пасля З. сталі абавязковы *водпуск*, які забяспечвае зададзенае спалучэнне цвёрдасці, трываласці, вязкасці і пластычнасці. Загартоўваюць таксама старэючыя сплавы (для атрымання перанасычанага цвёрдага раствору, які распадаецца пры старэнні з умацаваннем), вадкасці (для фіксацыі шклопадобнага стану), шкло (для зніжэння дэфектнасці і паляпшэння мех. уласцівасцей) і інш. Пры З. цвярдзеюць толькі сталі, якія загартоўваюцца на мартэнсіт; З. металічных сплаваў (старэючых, накляпаных і інш.) суправаджаецца зніжэннем цвёрдасці.

Літ.: Курдюмов Г.В. Явления закалки и отпуска стали. М., 1960. *Г.Г.Паніч.*

ЗАГАРУ́ЛЬСКІ Эдуард Міхайлавіч (н. 18.12.1928, г. Тула, Расія), бел. археолаг, гісторык. Д-р гіст. н. (1984), праф. (1985). Скончыў Маскоўскі ун-т (1953). З 1954 у Ін-це гісторыі АН Беларусі, з 1962 у БДУ: з 1973 заг. кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гіст. дысцыплін, у 1986—91 дэкан гіст. ф-та. Вывучае пытанні археалогіі і стараж. гісторыі Беларусі, праблемы этнагенезу славян і іх прарадзімы, гісторыю гарадоў. Даследаваў помнікі жал. веку і ранняга сярэдневякоўя. У час раскопак у Мінску вызначыў агульную планіроўку горада 11—13 ст., абарончыя ўмацаванні і забудову, зрабіў рэканструкцыю ўсх. часткі замчышча.

Тв.: Древний Минск. Мн., 1963; Археология Белорусии. Мн., 1965; Древняя история Белоруссии: Очерки этнич. истории и материальной культуры (до IX в.). Мн., 1977; Возникновение Минска. Мн., 1982; Заходняя Русь. Мн., 1998.

ЗАГАТО́ВАЧНЫ СТАН, адзін з відаў *пракатных станаў*, на якім *блюмы* або *зліткі* пракатваюць у загатоўкі, што потым апрацоўваюцца на сартавых, трубапракатных і інш. спецыялізаваных станах. Адрозніваюць З.с. неперарыўныя, лінейныя і з паслядоўным размяшчэннем клецей; загатовачныя сартавыя і трубазагатовачныя.

Найб. пашыраны неперарыўныя З.с., якія ўстанаўліваюцца непасрэдна за *блюмінгамі*. На іх метал абціскаецца пачаргова ў клецях з верт. і гарыз. валкамі, атрымліваюць квадратныя, часам плоскія і круглыя загатоўкі. Станы аўтаматызаваны, кіруюцца з дапамогай ЭВМ, маюць прадукцыйнасць да 5 млн. т. загатовак за год. Лінейныя З.с. выкарыстоўваюцца пераважна для пракаткі загатовак з высакаякасных сталей, станы з паслядоўным размяшчэннем клецей — для пракаткі круглых трубных загатовак.

ЗАГА́ЦЦЕ, Загач, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мядзелка, за 3,5 км на ПдЗ ад г. Паставы. Пл. 0,3 км^2, даўж. 1,3 км, найб. шыр. 330 м, найб. глыб. 7,8 м, даўж. берагавой лініі каля 3,6 км. Пл. вадазбору 9,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 12—15 м. Берагі пад хмызняком, на З і Пн месцамі сплавінныя. Пойма шыр. да 10 м, забалочаная, пад хмызняком. Дно гліністае. Шыр. паласы расліннасці да 20 м, у паўн.-ўсх. заліве да 200 м. Упадаюць 6 ручаёў. Злучана ручаём з Задзеўскім возерам.

ЗАГА́ЦЦЕ, вадасховішча ў Ельскім р-не Гомельскай вобл., за 15 км на ПдЗ ад г. Ельск, каля в. Загацце. Створана ў 1982. Пл. 0,7 км^2, даўж. 1,9 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 6,4 м, аб'ём вады 3 млн. м^3. Наліўное, напаўняецца вадой з прытока Высока-Махнавіцкага канала. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 4,7 м. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель, рыбаводства.

ЗАГЛЕ́ЙВАННЕ, 1) адкладанне ў вадасховішчах, азёрах, арашальных каналах і інш. водных аб'ектах з застойнай ці павольна цякучай вадой завісных і цягненых наносаў (глею, пяску, гравію, гліны, рэшткаў раслін). На скорасць З. ўплываюць прыродныя асаблівасці вадазбору (нахілы рэльефу, характар грунтоў, разаранасць, расліннае покрыва). Інтэнсіўнае З. прыводзіць да ліквідацыі вадасховішчаў. 2) Адкладанне ў пойме паводкавых наносаў ракі або яроў. 3) Метад *меліярацыі* пясчаных зямель.

«ЗАГЛЯ́НЕ СО́НЦА І Ў НА́ША АКО́НЦА», першая легальная бел. выдавецкая суполка. Існавала ў Пецярбургу ў 1906—14. Створана па ініцыятыве Б.І.*Эпімах-Шыпілы*; ставіла перад сабой асветныя мэты. Выдавала кнігі (38 назваў, агульным тыражом больш за 100 тыс. экз.), навук.-папулярныя і публіцыстычныя брашуры, паштоўкі з краявідамі Беларусі і партрэтамі бел. пісьменнікаў. Кнігі друкаваліся ў польскай друкарні К.Л.Пяткоўскага кірыліцай і лацінкай. Асн. частка тыражу трапляла на Беларусь. Дзейнасць пачала з выдання падручнікаў для школ, сярод якіх «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» (1906), «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі (1906), «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я.Коласа (1909). У 1907—09 наладзіла выданне літ. спадчыны ў падпісной серыі «Беларускія песняры» (творы В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча і інш.). З аб'яўленых 8 кніг да сак. 1908 выйшла 6, кожная тыражом 4300 экз. Выдала першыя кнігі Я.Купалы («Жалейка», 1908), З.Бядулі («Абразкі»), Ц.Гартнага («Песні», абедзве 1913). Асобнымі кнігамі перавыдала творы Дуніна-Марцінкевіча «Вечарніцы» (1909), «Шчароўскія дажынкі» і «Купала» (1910). У 1910—13 літаграфскім спосабам выдала рэпертуарную серыю драм. твораў («Модны шляхцюк» К.Каганца, «Сватанне» А.Чэхава, «Пашыліся ў дурні» і «Па рэвізіі» М.Крапіўніцкага, «Хам» Э.Ажэшкі, «Паўлінка» Купалы). Суполцы належыць спроба стварэння літ.-мастацкага альманаха «*Маладая Беларусь*». Дзейнасць суполкі прыпынена ў сувязі з 1-й сусв. вайной.

Літ.: Александровіч С.Х. Пуцявіны роднага слова. Мн., 1971. С. 169—184; Семашкевіч Р.М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбургу (канец XIX — пачатак XX ст.). Мн., 1971; Саламевіч Я. Выйшлі з светлага знання сяўбою // Маладосць. 1986. № 6; Туронак Ю. «Загляне сонца...» і Вацлаў Іваноўскі // Спадчына. 1992. № 2. *Н.П.Ракіцкая.*

ЗАГО́РНАЕ, вёска ў Нагорнаўскім с/с Клецкага р-на Мінскай вобл., каля шашы Слуцк—Івацэвічы. Цэнтр калгаса. За 10 км на ПдУ ад Клецка, 150 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Клецк. 422 ж., 223 двары (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка.

ЗАГО́РНАЕ ВО́ЗЕРА, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрысвята

(звязана з возерам ручаём), за 27 км на ПдЗ ад г. Браслаў. Пл. 0,36 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. 400 м, найб. глыб. 6,7 м, даўж. берагавой лініі 4,1 км. Пл. вадазбору 2,9 км^2. Схілы катлавіны выш. 3—5 м, разараныя. Берагі выш. 0,1—0,3 м, пясчаныя, пад хмызняком. Мелкаводдзе вузкае, стромкае, пясчанае, глыбей дно глеістае. Зарастае.

ЗАГО́РСКАЕ РАДО́ВІШЧА ГЛІН, у Гродзенскім р-не, каля в. Загорцы. Пластавы паклад звязаны з азёрна-ледавіковымі адкладамі паазёрскага зледзянення. Гліны бурыя, буравата-жоўтыя, шэрыя, стужачныя, шчыльныя, пластычныя, месцамі вязкія з тонкімі пясчанымі праслойкамі. Разведаныя запасы 5,3 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 2,8—8,1 м, ускрышы (супескі, дробназярністыя пяскі) 0,2—3,4 м. Гліны прыдатныя на выраб цэглы.

А.П.Шчураў.

ЗАГО́РСКАЯ Ніна Сямёнаўна (н. 16.7.1940, в. Загор'е Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. паэтэса, публіцыст, крытык. Засл. работнік культуры Беларусі (1992). Скончыла БДУ (1962). Працавала на Бел. радыё і тэлебачанні, з 1982 у Мін-ве культуры Беларусі, з 1996 у Бел. ун-це культуры. Друкуецца з 1958. Творчасці ўласцівы лірыка-філас. светаразуменне, актуальнасць і сац. скіраванасць тэматыкі. Аўтар паэт. зб-каў «Радар» (1975), «Явар» (1982), «Мне добра з вамі» (1989). Асобныя яе вершы пакладзены на музыку.

ЗАГО́РСКІ Пётр Андрэевіч (20.8.1764, г. п. Панорніца Чарнігаўскай вобл., Украіна — 1.4.1846), расійскі і ўкраінскі анатам і фізіёлаг, заснавальнік рус. анат. школы. Акад. (1807), ганаровы чл. (1841) Пецярбургскай АН. Скончыў Пецярбургскае мед.-хірург. вучылішча (1786). З 1799 у Мед.-хірург. акадэміі. Прыхільнік функцыян. і эвалюц. кірунку у анатоміі. Увёў абавязковыя заняткі для студэнтаў на трупах. Навук. працы па анат. анамаліях і механізме іх узнікнення, параўнальнай анатоміі.

ЗАГО́РТАЧНАЯ МАШЫ́НА, аўтаматычная або паўаўтам. машына для загортвання (упакоўкі) масавых фасаваных вырабаў паштучна (цукеркі, мыла і інш.) ці ў пэўнай колькасці (напр., пачкі пячэння, цыгарэт). Звычайна складаецца з гарыз. або верт. загортачнага механізма (ротара) і механізмаў падачы вырабаў і пакавальных матэрыялаў (паперы, цэлафану, фольгі і інш.). Выкарыстоўваецца як самаст. агрэгат або як састаўная частка тэхнал. ліній (пераважна ў харч. і лёгкай прам-сці).

ЗАГО́РЫНЫ, археалагічныя помнікі (паселішча каменнага і могільнік бронзавага вякоў, гарадзішча эпохі Кіеўскай Русі) каля в. Загорыны Мазырскага р-на Гомельскай вобл. У ніжнім гарызонце паселішча знойдзены мезалітычныя крамянёвыя прылады працы, мікраліты, зброя і кераміка позняга мезаліту і ранняга неаліту (7—4-е тыс. да н.э.), у верхнім — позняга неаліту і бронз. веку (3—2-е тыс. да н.э.). Выяўлены рэшткі неаліт. стаянкі і грунтавых пахаванняў культуры шнуравой керамікі Палесся. На гарадзішчы 12—13 ст. знойдзены рэшткі посуду і касцей чалавека.

ЗАГО́СКІН Лаўрэнцій Аляксеевіч (2.6.1808—3.2.1890), рускі даследчык Аляскі, марскі афіцэр. Скончыў Марскі кадэцкі корпус, служыў у Пецярбургу і г. Астрахань. У 1842—44 па заданні Расійска-амерыканскай кампаніі апісаў ч. заліва Нортан, адкрыў горны хрыбет у бас. р. Юкан, даследаваў рэкі Куікпак і Кускакуім. Вынікі экспедыцыі апублікаваны ў творы: «Пешаходны вопіс часткі рускіх уладанняў у Амерыцы, зроблены ў 1842, 1843 і 1844 гг.» (ч. 1—2, 1847—1848), перавыданне — «Падарожжы і даследаванні лейтэнанта Лаўрэнція Загоскіна ў Рускай Амерыцы ў 1842—1844 гг.» (1956).

Літ.: Адамов А. Первые русские исследователи Аляски. М., 1950.

ЗА́ГРАБ (Zagreb), горад, сталіца Харватыі, на р. Сава, каля падножжа хр. Мядзведніца. 868 тыс. ж., з прыгарадамі каля 1 млн. ж. (1991). Вузел чыгунак і аўтадарог з Цэнтр. і Зах. Еўропы да Адрыятычнага м. і на Балканскі п-аў. Рачны порт. Міжнар. аэрапорт. Эканам. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: маш.-буд. (аўтамабілі, чыг. вагоны, эл. машыны, трансфарматары, акумулятары, мед. тэхніка і інструменты), хім., нафтаперапр., лёгкая, фармацэўтычная, дрэваапр., буд. матэрыялаў, харч., паліграфічная. Акадэмія навук і мастацтваў. Ун-т. Штогадовыя міжнар. гандл. кірмашы і фестывалі фальклору.

Стараж.-рымская Андаўтонія. З канца 11 ст. належаў Венгрыі; рэзідэнцыя епіскапства (засн. да 1094). З 1242 свабодны каралеўскі горад, стаў эканам. цэнтрам Харватыі. З 1527 З. (пад ням. назвай Аграм) у складзе Габсбургскай манархіі. З сярэдзіны 17 ст. тут знаходзіўся харвацкі бан (намеснік караля). У 1606 у З. з'явіліся езуіты, якія заснавалі акадэмію (1669) і друкарню (1664). Эканам. і культ. развіццё горада актывізавалася ў 19 ст.; цэнтр нац. адраджэння харватаў (гл. *Ілірызм*). У 1846 у З. створаны Нац. музей, у 1867 — Югаславянская акадэмія навук і мастацтваў, у

Заграб.

1874 — універсітэт. 29.10.1918 у З. харвацкі сейм абвясціў незалежнасць Харватыі і ўступленне яе ў Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія). У перыяд паміж сусв. войнамі адзін з найб. прамыслова развітых гарадоў краіны. У 1941—45 сталіца створанай харвацкімі фашыстамі (усташамі) Незалежнай дзяржавы харватаў. У час ням.-фаш. акупацыі адзін з гал. цэнтраў *Руху Супраціўлення*. Вызвалены 8.5.1945 войскамі Нар.-вызв. арміі Югаславіі. З 1991 сталіца незалежнай Харватыі.

Гіст. ядро З. — раёны Каптол і Градзец, размешчаныя на ўзгорках (Верхні горад): рэшткі ўмацаванняў (13—18 ст.), гатычны сабор св. Сцяпана (13—19 ст.) і гатычная царква св. Марка (14—19 ст., у інтэр'еры работы скульпт. І.Мештравіча), барочныя царква св. Кацярыны (1620—19 ст.) і епіскапскі палац (каля 1730—19 ст.), у стылі класіцызму — палац Елачычаў (19 ст., фасад — 1831, арх. Б.Фелбінгер). З 2-й пал. 19 ст. на Пд складваецца новы цэнтр З. з кварталамі, скверамі, парадными пабудовамі з рысамі эклектызму і неакласіцызму: Харвацкі нар. тэатр (1894—95), біржа (1923—27), жылыя дамы ў стылі функцыяналізму. З 2-й пал. 1940-х г. будуюцца грамадскія будынкі, новыя жылыя раёны, спарт. комплексы. Музеі: Галерэя старых майстроў (галерэя Штросмаера), Музей мастацтваў і рамёстваў, Гар. галерэя сучаснага мастацтва і Галерэя прымітывістаў, археал. і этнагр. музей.

Літ.: Маркова Е.С. Загреб в XVI в.: Из истории социально-экон. отношений в феод. городе. М., 1976; Яе ж. Из истории социально-экономического развития славянского города XIII—XVII вв. М., 1980.

Н.К.Мазоўка (гісторыя).

ЗАГРАБЕ́ЛЬНЫ Павел Архіпавіч (н. 25.8.1924, в. Салошына Палтаўскай вобл., Украіна), украінскі пісьменнік. Скончыў Днепрапятроўскі ун-т (1951). Дэбютаваў як навеліст (зб-кі «Стэпавыя кветкі», 1955; «Настаўнік», 1957; «Навелы марскога ўзбярэжжа», 1958). Вял. Айч. вайне прысвяціў аповесць «Дума пра неўміручага» (1957) і раманы «Еўропа 45» (1959), «Еўропа. Захад» (1961). Гісторыі Украіны прысвечаны раманы «Дзіва» (1968), «Першамост» (1972), «Смерць у Кіеве» (1973; за 2 апошнія Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1974), «Еўпраксія» (1975), «Раксалана» (1980), «Я,Багдан» (1983). Праблемы духоўнага і матэрыяльнага ў сучасным жыцці асэнсаваны ў раманах «Спякота» (1960), «Пераходзім да любові» (1971), «Разгон» (1976; Дзярж. прэмія СССР 1980), «Львінае сэрца» (1978), «Паўднёвы камфорт» (1984) і інш. Яго творы вызначаюцца вастрынёй сюжэта, дынамічнасцю дзеяння, публіцыстычнасцю. На бел. мову паасобныя творы З. пераклалі Л.Салавей, У.Паўлаў.

Тв.: Твори. Т. 1—6. Київ, 1979—81; Рус. пер. — Собр. соч. Т.1—5. М., 1986—87.

Літ.: Фащенко В. Павло Загребельний. Київ, 1984; Шпиталь А.Г. Історична проза Павла Загребельного. Київ, 1986.

В.А.Чабаненка.

ЗАГРО́С, горная сістэма ў Іране, на ПдЗ Іранскага нагор'я. Даўж. 1600 км, шыр. 200—300 км, пераважныя выш. 2—3 тыс. м, найб. 4548 м (г. Зердкух). Складаная сістэма з 15—20 паралель-

ных хрыбтоў, якія працягнуліся з ПнЗ на ПдУ і падзелены падоўжнымі і папярочнымі вузкімі каньёнападобнымі цясніна мі і катлавінамі. Невялікія ледавікі. Складзена пераважна з вапнякоў і сланцаў мезазою і кайназою. Карст. У цэнтр. ч. і на ПнУ агаляецца дамезазойскі фундамент з вял. салянымі купаламі. Радовішчы нафты. Клімат субтрапічны, сухі. Пераважаюць горна-пустынныя ландшафты. У міжгорных катлавінах азёры, саланчакі, аазісы (фінікавая пальма, цытрусавыя, вінаград). Зах. ч. сярэдняга пояса найб. вільготная (лясы і рэдкалессі з дубу, вязу, клёну і інш.); вышэй — альпійскія лугі і нізкаслая хмызняковая расліннасць.

ЗАГРУ́ЗЧЫК КАРМО́Ў, машына для транспартавання і мех. загрузкі сухіх і вільготных кармоў у бункеры-сілкавальнікі паточных ліній, у бункеры *раздатчыкаў кармоў* або ў інш. ёмістасці. Бываюць навясныя, паўнавясныя, прычэпныя і самаходныя. З.к. на шасі аўтамабіляў маюць бункеры ўмяшчальнасцю ад 3 да 8 м^3.

ЗАГУ́ЗЗЕ, радовішча пясчана-жвіровага матэрыялу і пяску ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., каля в. Загуззе. Паклад (3 участкі) звязаны з краявымі і флювіягляцыяльнымі адкладамі паазерскага зледзянення. Пясчана-жвіровая парода жаўтавата-шэрая, бурая, месцамі гліністая, з праслоямі і лінзамі пяскоў. Разведаныя запасы 33,8 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 2—19,8 м, ускрышы (пяскі, супескі, гліны) 0,2—5,3 м. Жвір і пясок прыдатныя ў дарожным буд-ве, на выт-сць бетону, сілікатнай цэглы. Радовішча распрацоўваецца.

А.П.Шчураў.

ЗАДАВА́ЛЬНЫ ГЕНЕРА́ТАР, маламагутны *генератар* эл. ваганняў высокай частаты з самаўзбуджэннем у радыёперадатчыках сярэдняй і вял. магутнасці. Ваганні, атрыманыя ад З.г., пераўтвараюцца і ўзмацняюцца адной ці некалькімі далейшымі ступенямі. Адрозніваецца высокай стабільнасцю частаты і незалежнасцю яе ад нагрузкі; у З.г. найб. пашырана кварцавая стабілізацыя частаты (гл. *Кварцавы генератар*).

ЗАДА́ТАК, грашовая сума, якая выдаецца адным з бакоў дагавору другому боку ў лік належачых плацяжоў. З'яўляецца доказам заключэння дагавору і сродкам забеспячэння яго выканання. Паводле цывільнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь у выпадку, калі дагавор застаецца невыкананым па віне боку, які даў З., ён застаецца ў другога боку. Калі ў невыкананні павінен бок, які атрымаў З., апошні павінен вярнуць яго ў двайным памеры. Бок, адказны за невыкананне дагавору, абавязаны кампенсаваць другому боку страты з залікам сумы З.

ЗАДЗВІ́НСКАЕ ГЕ́РЦАГСТВА (лац. Ducatus Ultradunensis), назва часткі *Ліваніі* ў 2-й пал. 16 — 1-й пал. 17 ст. Занята войскамі Польшчы, ВКЛ у час *Лівонскай вайны 1558—83*. Уключала тэр. паўн. Латвіі (без Рыгі) і паўд. Эстоніі. У 1561—1629 у складзе ВКЛ (з 1569 Рэчы Паспалітай). Цэнтр г. Дынабург (цяпер г. Даўгаўпілс, Латвія). Падпарадкоўвалася польск. каралю, кіраваў прызначаны ім губернатар. У З.г. панавала ням. рыцарства, якое захавала за сабой б.ч. ўсіх зямель і суд.-паліцэйскую ўладу над сялянамі. У выніку працяглай польска-швед. вайны (з 1600) З.г. паступова распалася, а яго тэр., акрамя Латгаліі, у 1629 адышла да Швецыі.

ЗАДЗЕ́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мядзелка, на зах. ускраіне г. Паставы. Пл. 0,92 км^2, даўж. 2,5 км, найб. шыр. 640 м, найб. глыб. 21,8 м, даўж. берагавой лініі 8,2 км. Пл. вадазбору 68,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 5—12 м, разараныя. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі пад хмызняком, на Пд сплавінныя. Дно складанай будовы, каля берагоў пясчанае, глыбей — глеістае. Востраў пл. 0,9 га. Зарастае. Праз возера цячэ р. Спорыша, злучана ручаём з воз. Загацце.

ЗА́ДНЕВА, вёска ў Азерашкім с/с Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 10 км на ПнУ ад Талачына, 128 км ад Віцебска, 13 км ад чыг. ст. Талачын. 125 ж., 46 двароў (1997). Пачатковая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ЗА́ДНІ МОЗГ, аддзел *цэнтральнай нервовай сістэмы* паміж сярэднім і прадаўгаватым мозгам, які складаецца з вароліева моста і мазжачка.

У вароліевым месце мноства папярочных і падоўжных нерв. валокнаў, сканцэнтраваны рухальныя і адчувальныя шляхі ц.н.с., размешчаны сеткападобная рэтыкулярная фармацыя (каардынуе дзейнасць сістэм, што рэгулююць вегетатыўна-вісцэральныя і сенса-маторныя функцыі арганізма), ядры некаторых чэрапна-мазгавых нерваў, цэнтры, што рэгулююць слінацячэнне, міганне, голасаўтварэнне. Мазжачок размешчаны ў задняй чарапной ямцы пад патылічнымі долямі паўшар'яў вял. мозга; вытворнае задняга *мазгавога пузыра*. Інтэгруе інфармацыю ад мышчаных рэцэптараў, вестыбулярнай сістэмы, маторных цэнтраў; каардынуе работу мышцаў; рэгулюе мышачны тонус.

Г.Дз.Сітнік.

ЗА́ДНІ МОСТ, сукупнасць вузлоў ці асобных агрэгатаў шасі самаходных машын (аўтамабіля, трактара і інш.), якая з'яўляецца апорай задняй часткі машыны і звычайна перадае вярчальны момант ад карданнага вала ці непасрэдна каробкі перадач *рухачу*. Мае картэр, кажухі паўвосей, гал. перадачу з дыферэнцыялам і паўвосі. На З.м. ўстанаўліваюць колавыя тармазы і калодкі з колами. Злучаецца з рамай (ці нясучым кузавам) непасрэдна (калі заднія колы маюць незалежную падвеску) або з дапамогай падвескі.

ЗАДНІ́ПРУ (Zadnipru) Пётр Іонавіч (13.1.1927, с. Саука, Малдова — 23.9.1976), малдаўскі паэт. Скончыў Кішынёўскі ун-т (1952). Дэбютаваў у 1952 паэт. зб-камі «Святло палёў» і «Стэпавыя агні». У кнігах «Людзі, дарагія людзі...» (1962), «Смак хлеба» (1964), «Сыны вы мае, сыны!..» (1977) апаэтызаваў жыццё малд. вёскі, яе праблемы і клопаты. Пераклаў на малд. мову асобныя творы Я.Купалы. На бел. мову творы З. пераклалі М.Лужанін, С.Панізнік, Г.Шупенька.

ЗА́ДНЯЕ ВО́ЗЕРА, Галбея Паўднёвая, у Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Галбіца (працякае праз возера), за 5 км на Пн ад г. Паставы. Пл. 0,36 км^2, даўж. 1,7 км, найб. шыр. 420 м, даўж. берагавой лініі 4,2 км. Схілы катлавіны выш. да 6 м, на З і ПнУ разараныя, на ПдЗ пад лесам. На З упадае ручай Цімара.

ЗА́ДНЯЕ ВО́ЗЕРА, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Эса, за 6 км на Пд ад г. Лепель. Пл. 0,26 км^2, даўж. 1 км, найб. шыр. 420 м, даўж. берагавой лініі 2,6 км. Пл. вадазбору 32,6 км^2. Схілы катлавіны выш. да 15 м, пад лесам і хмызняком, на ПнУ месцамі разараныя. На Пн злучана ручаём з Доўгім возерам, на Пд выцякае ручай у р. Эса.

ЗАДНЯШЧЭ́ЛЕПНЫЯ (Opisthobranchia), падклас *бруханогіх малюскаў*. 12 атр., па інш. сістэме 5. Каля 13 тыс. відаў. Пашыраны на розных глыбінях Сусветнага ак., некат. ў прэсных водах. Большасць жыве на марскім дне, на пясчаным або глеістым грунце. Найб. вядомыя З.: актэон (Actaeon tornatilis), марскі заяц (Aplysia depilans), куклянка-парасон (Umbrella mediterranea) і інш.

Цела выцягнутае, пляскатае. Нага часта відазмененая, яе бакі могуць разрастацца ў крылападобныя лопасці (параподыі) для плавання. Па баках спіны часта скурныя нарасці (другасныя шчэлепы). Мантыйны комплекс ссунуты назад на правым баку цела (адсюль назва). Гермафрадыты. У большасці развіццё праз планктонную лічынку (велігер). Драпежнікі і расліннаедныя.

ЗАДО́БРАСЦЬ, рака, гл. *Добрасць*.

«ЗАДО́РА», прыватнаўладальніцкі герб, якім у Польшчы, Беларусі, Літве і на Украіне карысталіся больш за 60 родаў, у т.л. Борхі, Даўгялы, Кезгайлы, Лянцкаронскія. У блакітным полі сярэбраная галава льва, з пашчы шугае полымя; клейнод — над прылбіцай з каронай



Задні мост аўтамабіля: 1 — вал; 2, 3 — галоўная перадача; 4 — дыферэнцыял; 5 — паўвось; 6 — картэр.

такая ж галава. Вядомы з канца 14 ст., у ВКЛ — пасля *Гарадзельскай уніі 1413.* *В.С.Пазднякоў.*

Герб **«Задора»**.

ЗАДО́Р'Е, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе в. Даўгінава — в. Жардзяжжа. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 50 км на Пн ад г.п. Лагойск, 90 км ад Мінска, 35 км ад чыг. ст. Будслаў. 352 ж., 135 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАДО́РЫН Андрэй Германавіч (н. 22.8.1960, в. Бярозаўка Пермскай вобл., Расія), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1984). Творчасці ўласцівы індывідуальнасць бачання свету, псіхал. выразнасць кампазіцый, тонкі каларыт. Сярод работ: «Вяртанне. 1953 год» (1987), «Курапаты», «Калядныя яблыкі», «Сынок, тут быў сад», «Партрэт мастацтвазнаўцы», «Галлё для вогнішча» (усе 1988), «Зімовы сад» (1989) і інш. *М.М.Пагранóўскі.*

А.**Задорын**. Калядныя яблыкі. 1988.

ЗАДРА́ЧАНСКАЕ ВО́ЗЕРА, З а д р а ч, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ловаць (працякае праз возера), за 40 км на ПнУ ад г. Гарадок. Пл. 0,77 км^2, даўж. 2 км, найб. шыр. 570 м, найб. глыб. 6,4 м, даўж. берагавой лініі 4,7 км. Пл. вадазбору 36,6 км^2. Схілы катлавіны выш. 5—7 м (на У і ПнУ да 30 м), на Пд і ПдЗ пад лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі тарфяністыя. Пойма шыр. 5—70 м. Дно ўздоўж берагоў пясчанае, глыбей — глеістае. Зарастае слаба.

ЗАДРО́ЎЕ, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл., на р. Адроў, на аўтадарозе Мінск—Масква. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на З ад г. Орша, 88 км ад Віцебска, 12 км ад чыг. ст. Коханава. 329 ж., 128 двароў (1997). Пач. школа, б-ка. Каля вёскі селішча жал. веку і ранняга сярэдневякоўя.

ЗА́ДРУГА (сербахарвацкае), у паўднёвых славян ранейшая назва вялікай патрыярхальнай сям'і; разнавіднасць сямейнай *абшчыны.* Складалася з некалькіх пакаленняў нашчадкаў аднаго бацькі з іх жонкамі і дзецьмі; гаспадарка і спажыванне агульныя. Налічвала 20—30 чал. (часам 50—80). Існавала да 2-й пал. 19 ст.

ЗАДРУ́ЦКІ СКАРБ, манетны скарб, знойдзены ў 1893 на беразе Дняпра каля в. Задрущце Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Ухаваны ў 13 ст. У гліняным гаршку знаходзілася 89 цэлых і 3 фрагменты сярэбраных грыўняў-зліткаў 13 ст. агульнай масай 14,5 кг. Імператарская археал. камісія (Пецярбург) размеркавала знаходку паміж музеямі Расіі, Германіі, ЗША і распрадала прыватным асобам. 13 зліткаў у 1929 перададзены Эрмітажу.

ЗАДРУ́ЦЦЕ, археалагічныя помнікі *дрыгавічоў* (гарадзішча і курганны могільнік) каля в. Задрущце Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Гарадзішча памерам 83×85 м умацавана валам выш. 1—3 м, шыр. 8—15 м. Курганны могільнік 10—11 ст. (з 40 насыпаў захаваліся 3). Пахавальны абрад — трупапалажэнне, пераважна галавой на З. Знойдзены рэшткі дамавін, жал. цвікі, ганчарны посуд, пацеркі са шкла, бронзы, сердаліку, бронзавыя пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы. *Э.М.Зайкоўскі.*

ЗАДУБРО́ЎЕ, вёска ў Віцебскім р-не, на аўтадарозе Віцебск—г.п. Сураж. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 36 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Віцебск. 638 ж., 232 двары (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЗАДУНА́ЙСКАЯ СЕЧ, арганізацыя запарожскіх казакоў у 1775—1828 на тэр. *Асманскай імперыі*, у вусці Дуная, куды яны ўцяклі пасля скасавання *Запарожскай Сечы* (1775). У 1806 і 1828 большая частка запарожцаў вярнулася ў Расію і склала Дунайскае і Азоўскае казацкія войскі.

ЗАДЫ́ШКА, парушэнне частаты, рытму і глыбіні дыхання, якое суправаджаецца няхваткай паветра. Пры хваробах сэрца З. бывае ад фіз. нагрузкі, потым і ў спакоі, асабліва ў гарыз. становішчы (хворыя павінны сядзець). Прыступы рэзкай З. (найчасцей ноччу) пры хваробах сэрца — праяўленне *астмы* сардэчнай. У гэтых выпадках З. і н с п і р а т о р н а я (цяжкі ўдых). Э к с п і р а т о р н а я З. (цяжкі выдых) бывае пры звужэнні прасвету дробных бронхаў і бранхіёл (напр., пры астме бранхіяльнай) ці пры нізкай эластычнасці лёгачнай тканкі (напр., пры хранічнай *эмфіземе лёгкіх*). Мазгавая З. ўзнікае пры раздражненні дыхальнага цэнтра (пухліны, кровазліцці і інш.).

ЗАДЫЯ́К, п о я с з а д ы я к а (грэч. zōdiakos ад zōon жывёла), сукупнасць сузор'яў, размешчаных уздоўж бачнага гадавога шляху Сонца (*экліптыкі*). Складаецца з 13 сузор'яў, але старажытныя астраномы падзялілі яго на 12 роўных частак (аб'ядноўвалі сузор'і Скарпіён і Змеяносец у адзінае пад агульнай назвай Скарпіён): *Рыбы, Авен, Цялец, Блізняты, Рак, Леў, Дзева, Шалі, Скарпіён, Стралец, Казярог, Вадаліў.*



Да арт. **Задыяк**. Бачны гадавы рух Сонца па задыяку і сапраўдны рух Зямлі вакол Сонца.

Большасць гэтых сузор'яў мае назву жывёл, таму ў старажытнасці іх называлі «З.» («круг жывёл»), а сузор'і — задыякальнымі. Кожнае з іх абазначаецца адпаведным знакам (гл. *Знакі астранамічныя і астралагічныя*). У задыякальным сузор'і Сонца знаходзіцца прыблізна адзін месяц. Вясною, напр., яно паслядоўна праходзіць па сузор'ях Рыб, Авена, Цяльца. Гэтыя сузор'і не відаць ноччу, бо знаходзяцца разам з Сонцам пад гарызонтам. Процілеглыя сузор'і Дзевы, Шаляў, Скарпіёна відаць усю ноч. Рух Сонца па З. — з'ява ўяўная, гэта вынік сапраўднага і процілегла накіраванага руху Зямлі вакол Сонца. Існуе адпаведнасць знакаў З. каляндарным датам, у якія Сонца праходзіла межы сузор'яў у старажытнасці (каля 2 тыс. гадоў назад). У выніку прэцэсіі зямной восі гэтыя даты змяніліся (гл. табл.). Рух планет і іх размяшчэнне ў сузор'ях З. выкарыстоўваюць астролагі для складання *гараскопаў*, пры гэтым яны карыстаюцца стараж. датамі праходжання Сонцам сузор'яў З.

Літ.: Бялко А.В. Наша планета — Земля. М., 1983. *Н.А.Ушакова.*

Табліца

Старажытныя і сучасныя даты знаходжання Сонца ў сузор'ях Задыяка

Сузор'е	Старажытныя даты	Сучасныя даты
Авен	21.3—19.4	22.4—21.5
Цялец	20.4—20.5	22.5—21.6
Блізняты	21.5—21.6	22.6—22.7
Рак	22.6—22.7	23.7—23.8
Леў	23.7—22.8	24.8—23.9
Дзева	23.8—22.9	24.9—24.10
Шалі	23.9—22.10	25.10—23.11
Скарпіён	23.10—21.11	24.11—23.12
Стралец	22.11—21.12	24.12—22.1
Казярог	22.12—19.1	23.1—20.2
Вадаліў	20.1—18.2	21.2—18.3
Рыбы	19.2—20.3	19.3—21.4

ЗАДЫЯКА́ЛЬНАЕ СВЯТЛО́, свячэнне начнога неба, якое назіраецца ўздоўж *экліптыкі* (на фоне сузор'яў *Задыяка*). Мае форму нахіленага светлавога конуса, найб. яркага і шырокага паблізу Сонца; яго яркасць перавышае яркасць начнога неба ў 2—3 разы. З аддаленнем ад гарызонту звужаецца і пераходзіць у паласу, што слаба свеціцца і праходзіць цераз усё неба ўздоўж пояса Задыяка. У вобласці, процілеглай Сонцу, задыякальная паласа расшыраецца і пераходзіць у пляму авальнай формы, т. зв. *процівзяние*.

У сярэдніх шыротах З.с. найлепш назіраецца ў студз.—сак. на заходнім схіле неба адразу пасля захаду Сонца, а ў вер.—ліст. — на ўсходзе перад узыходам Сонца. У тропіках, дзе экліптыка перпендыкулярная гарызонту, З.с. амаль такое ж яркае, як *Млечны Шлях*, і яго можна назіраць уздоўж усёй экліптыкі. З.с. абумоўлена рассеяннем сонечнага святла часцінкамі міжпланетнага пылу, якіх асабліва шмат паблізу плоскасці экліптыкі.

Н.А.Ушакова.

ЗАЕ́ЧАЯ ГУБА́, гл. *Прыроджаная расколіна верхняй губы.*

ЗАЕ́ЧАЯ КАНЮШЫ́НА, кветкавая расліна, тое, што *вязель.*

ЗАЕ́ЧАЯ КАПУ́СТА, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Расходнік.*

ЗАЕ́ЧЫ ХМЕ́ЛЬ, кветкавая расліна, тое, што *вязель.*

ЗАЖО́Р, вялікая колькасць у рэчышчы ракі ўнутрыводнага лёду і шарашы ў час асенняга крыгаходу або ў пачатку ледаставу. З. памяншае плошчу жывога сячэння ракі, выклікае падняцце ўзроўню і затапленне поймы. Утвараецца звычайна ніжэй парогаў.

ЗАЖЫ́НКІ, старадаўні земляробчы звычай у беларусаў і інш. славянскіх народаў, звязаны з пачаткам жніва. Яго абрадавы сэнс быў скіраваны на тое, каб забяспечыць добры збор ураджаю. Звычайна З. спраўлялі ў суботу вечарам; перад гэтым прыбіралі хату і двор, стол засцілалі белым абрусам, клалі бохан хлеба с соллю. Зажынальніцай выбіралі жанчыну «лёгкую на руку», каб усё жніво прайшло спраўна. У першы выхад на ніву нажыналі невял. сноп жыта, перавязвалі яго чырвонай стужкай, неслі дахаты і ставілі на покуці (зерне з яго пасля дамешвалі да насення). У дзень З. рыхтавалася святочная вячэра, у час якой сям'я з'ядала хлеб і сыр, прынесеныя з поля. У наш час З. адзначаюць як свята першага снапа. *А.С.Ліс.*

ЗАЖЭ́ВІЧЫ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 20 км на У ад горада і чыг. ст. Салігорск, 141 км ад Мінска. 799 ж., 383 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

Да арт. **ЗАЗ**: легкавы аўтамабіль ЗАЗ-1102 Таўрыя.

ЗАЗ, сям'я легкавых аўтамабіляў асабліва малога класа, якія выпускае Запарожскі аўтамабільны з-д (Украіна) з 1960. Характэрная асаблівасць — рухавікі з паветр. ахаладжэннем. Мадэлі, якія выпускаліся да 1994, наз. «Запарожац», мелі задняе размяшчэнне рухавіка. Іх замянілі пярэднепрывадныя мадэлі «Таўрыя» з бензінавым рухавіком магутнасцю 53 кВт; найб. скорасць да 148 км/гадз.

ЗАЗЕ́КА Язэп (Іосіф Васілевіч; 24.6.1907, в. Востраў Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 27.8.1977), бел. пісьменнік. Канд. філал. н. (1949). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1936). У Айч. вайну ўдзельнік падп. і партыз. руху на Беларусі. Працаваў у Адэскім пед. ін-це (1949—52), БДУ (1952—73). Друкаваўся з 1930. Аўтар зб-каў апавяданняў «Рукою ворага» (1932) і нарысаў «Партызанскія сцежкі» (1959), кніг для дзяцей «Лясныя сябры» (1966), «Сонечны алень» (1969), «Трывожная ноч» (1972). Збіраў і даследаваў бел. фальклор. Укладальнік зб-каў партыз. творчасці «Песні барацьбы» (1946, з М.Меяровіч і С.Карабанам), «Лясныя песні» (1970, 2-е выд. 1974).

ЗА́ЗЕРКА, вёска ў Пярэжырскім с/с Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 43 км на ПнЗ ад раённага цэнтра Мар'іна Горка, 30 км ад Мінска, 0,5 км ад чыг. ст. Седча. 625 ж., 244 двары (1997). Дом культуры, б-ка.

ЗАЗЯМЛЕ́ННЕ, электрычнае злучэнне з зямлёю эл. машын, апаратаў, прылад, правадоў і інш., а таксама прыстасаванне, што забяспечвае такое злучэнне. Бывае ахоўнае (для засцярогі людзей), рабочае і маланкаахоўнае.

Ахоўнае З. (карпусоў эл. машын, апаратаў і інш.) засцерагае людзей ад паражэння эл. токам. Яно зніжае да небяспечных значэнняў напружанне дотыку або крокавае напружанне (пры прабоях ізаляцыі ці кароткіх замыканнях). Рабочае З. забяспечвае нармальную работу эл. машын, апаратаў, установак (зазямляюцца нейтралі трансфарматараў, нулявыя правады нізкавольтных ЛЭП, радыётэхн. антэны і інш.). Маланкаахоўнае З. засцерагае эл. ўстаноўкі і абсталяванне ад перанапружання і току маланкі. Зазямляюцца ахоўныя тросы паветраных ЛЭП, разраднікі, *маланкаадводы* на тэхн. збудаваннях і інш. З. складаецца з метал. электродаў (зазямляльнікаў) і праваднікоў, што злучаюць электроды з аб'ектам. Зазямляльнікі (стальныя трубы, рэйкі, стрыжні, стальныя або медныя лісты, палосы, правады і інш.) забіваюцца або закопваюцца ў зямлю (пажадана на глыбіню ўзроўню грунтавых вод), злучаюцца палосамі з дапамогай зваркі. Эл. супраціўленне кожнага тыпу З. строга рэгламентуецца і падлягае перыядычнай праверцы (замяраецца вымяральнікамі З., якія працуюць паводле прынцыпу вымяральнага моста або па кампенсацыйным прынцыпе з выкарыстаннем дапаможных зондаў-зазямляльнікаў).

ЗАІКА́ННЕ, функцыянальнае парушэнне мовы. Характарызуецца адвольнымі паўзамі рознай працягласці, паўторам асобных гукаў, складоў, слоў пры размове. Прычыны хваробы: генетычная схільнасць, частыя псіхатраўмы, неўратычны фон, саматычная аслабленасць. Найчасцей узнікае ў дзяцей ранняга ўзросту (2—5 гадоў). Лячэнне: псіхатэрапія, гіпноз і інш.

ЗАІЛІ́ЙСКІ АЛАТА́У, горны хрыбет на Пн Цянь-Шаня, у Казахстане, на мяжы з Кіргізіяй. Даўж. каля 350 км. Выш. да 4973 м (пік Талгар). Складзены пераважна з гранітаў, кангламератаў, вапнякоў і сланцаў. Пераважае высакагорны рэльеф. Агульная пл. зледзянення 484 км^2. З паўн. схілаў сцякаюць прытокі р. Ілі. Сухія стэпы змяняюцца з вышынёй хмызнякова-стэпавай расліннасцю, лугамі і лясамі. У паўн. перадгор'ях г. Алматы, а таксама зімовы спарт. комплекс Медэо. На зах. схіле З.А. Алма-ацінскі запаведнік.

ЗАІ́МІС (Zaimēs) Аляксандрас (28.10.1855, Афіны — 15.9.1936), дзяржаўны дзеяч Грэцыі. Атрымаў юрыд. адукацыю ў Германіі і Францыі. У 1896 і 1914—20 дырэктар грэч. нац. банка. Прэм'ер-міністр у 1897—99, 1901—02, 1915—17 (з перапынкамі), 1926—28; у 1929—35 прэзідэнт Грэцыі. Садзейнічаў дзярж. перавароту ў кастр. 1935, які прывёў да аднаўлення манархіі.

ЗАІ́Р (Zaïre), назва Дэмакратычнай Рэспублікі *Конга* ў 1971—97.

ЗА́ЙДЭЛЬМАН (Seydelmann) Карл (24.4.1793, г. Глац, Сілезія, цяпер г. Клодзка, Польшча — 17.3.1843), нямецкі акцёр. З 1815 у т-ры г. Брэслаў, з 1820 у Пражскім ням. гар. т-ры, у прыдворных т-рах Каселя, Штутгарта, Берліна. Прымаў удзел у рэжысёрскіх доследах К.Імермана (роля Натана Мудрага ў аднайм. п'есе Г.Лесінга), ва «ўзорных» спектаклях Дзюсельдорфскага т-ра. Найб. значныя ролі: Карлас, Мефістофель, Альба («Клавіга», «Фауст», «Эгмант» І.В. Гётэ), Рычард III, Атэла і Яга («Рычард III», «Атэла» У.Шэкспіра) і інш., у якіх выявілася высокая здольнасць да пераўвасаблення.

ЗА́ЙКАВА, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., каля воз. Сясіта. Цэнтр сельсавета. За 53 км на ПнУ ад г. Гарадок, 92 км ад Віцебска. 50 км ад чыг. ст. Гарадок. 85 ж., 43 двары (1997). Амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Магіла ахвяр фашызму.

ЗА́ЙЛЕР (Sailer) Антон (Тоні; н. 17.11.1935, г. Кіцбюэль, Аўстрыя), аўстрыйскі спартсмен (гарналыжны спорт). Алімп. чэмпіён у скорасным спуску, слаламе і гіганцкім слаламе (1956). Чэмпіён свету ў гарналыжным трохбор'і (1956, 1958), скорасным спуску і слаламе-гіганце (1958).

ЗАЙМЕ́ННІК, часціна мовы, якая паказвае на прадметы і якасці, не называючы іх. Канкрэтнае значэнне мае толькі ў звязнай мове, дзе выступае як марфалагічны сінонім да назоўніка, прыметніка ці лічэбніка. Паводле суадносін з інш. часцінамі мовы З. падзяляюць на назоўнікавыя, прыметнікавыя і лічэбнікавыя; паводле значэння — на асабовыя (я, мы, ты, вы), зваротны (сябе), прыналежныя (мой, наш, твой), пытальна-адносныя (хто, што, каторы), указальныя (гэты, той, такі), азначальныя (сам, увесь, кожны, іншы), адмоўныя (ніхто, нішто), няпэўныя (нехта, некаторы, нейкі). У сказе выконваюць ролю дзейніка, выказніка і дадатковых членаў сказа, найчасцей дапаўнення і азначэння.

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *Я.М.Камароўскі.*

ЗАЙСА́Н, прэснаводнае возера ў міжгорнай Зайсанскай катлавіне, на У Казахстана. Да пабудовы Бухтармінскай ГЭС на р. Іртыш пл. З. складала 1,8 тыс. км^2. Даўж. 111 км, шыр. каля 30 км, глыб. да 10 м. Пасля пабудовы 90-метровай плаціны З. знаходзіцца ў падпоры і складае значную ч. Бухтармінскага вадасховішча; яго ўзровень падняўся на 7 м. Упадае р. Чорны Іртыш, выцякае р. Іртыш. Рыбны промысел.

ЗАЙСА́НСКАЯ КАТЛАВІ́НА, міжгорная ўпадзіна на У Казахстана, паміж хрыбтамі Паўд. Алтая на Пн, Тарбагатаем і Саурам на Пд. Выш. днішча ад 370 м (воз. *Зайсан*) да 1000 м. Складзена з азёрных і рачных пяскоў і глін. У рэльефе вылучаюцца астанцовыя горныя масівы. Пераважаюць паўпустынныя ландшафты, якія выкарыстоўваюць як пашы; у дэльце р. Чорны Іртыш ёсць тугайныя лясы.

ЗА́ЙЦАЎ Аляксандр Міхайлавіч (2.7.1841, г. Казань, Татарстан — 1.9.1910), рускі хімік-арганік. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1885). Скончыў Казанскі ун-т (1862), дзе і працаваў з 1865. Вучань А.М.*Бутлерава*. Навук. працы па арган. сінтэзе і развіцці тэорыі хім. будовы Бутлерава. Адкрыў рэакцыю атрымання другасных і трацічных спіртоў уздзеяннем на карбанільныя злучэнні (альдэгіды, кетоны і інш.) цынку і алкілгалагенідаў (1875, рэакцыя З.), новы клас арган. злучэнняў — лактоны (1873). Устанавіў правіла адшчаплення галагенавадародаў ад другасных і трацічных галагенідаў і вады ад спіртоў (правіла З.) і далучэння пратонных кіслот да несім. ненасычаных вуглевадародаў (правіла З. — Вагнера). Сінтэзаваў дыэтылкарбінол, шэраг ненасычаных і мнагаатамных спіртоў, арган. аксідаў, аксікіслот.

Літ.: Ключевич А.С., Быков Г.В. А.М.Зайцев, 1841—1910. М., 1980.

ЗА́ЙЦАЎ Аляксандр Міхайлавіч (н. 8.8.1953, пас. Чарніцкі Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фізікі паўправаднікоў. Д-р фіз.-матэм. н. (1993). Скончыў БДУ (1975), дзе і працуе. Навук. працы па оптыцы звышшчвёрдых паўправаднікоў, высокаэнергет. іоннай імплантацыі, нанаструктураванні алмаза дыфузійнымі метадамі. Устанавіў шэраг заканамернасцей дэфектаўтварэння ў іонна-апрамененых паўправадніках, у т.л. эфект каналіравання ўздоўж трэкаў.

Тв.: Высокоэнергетичная ионная имплантация в полупроводники // Поверхность. 1991. № 10.

ЗА́ЙЦАЎ Анатоль Цімафеевіч (н. 13.9.1939, в. Гарадок Смаленскай вобл., Расія), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). Працуе ў кніжнай і станковай графіцы ў тэхніцы дрэварыту, у галіне афармленчага мастацтва. Творы адметныя лаканічнасцю выяўл. сродкаў, дынамічнасцю танальных градацый, кампазіцыйнай завершанасцю: гравюры да кнігі «Георгій Скарына» М.Садковіча і Я.Львова (1966), серыі нацюрмортаў «Вакол нас» (1967—83), пейзажы «Мая Беларусь» (1980—82), эстампы «Сажалка ў Вязынцы» (1982) і інш., экслібрысы. Афарміў інтэр'еры гандл. цэнтра ў калгасе «Савецкая Беларусь» Камянецкага р-на (1975), крамы будматэрыялаў «Еўралюкс» (1995) у Мінску, экспазіцыі фотавыстаўкі «Вялікі пясняр Беларусі — Янка Купала» (1992), выстаўкі «Эканоміка Беларусі» ў г. Прага (Чэхія, 1995, і інш.). Іл. гл. таксама да арт. *Дрэварыт*.

ЗА́ЙЦАЎ Веньямін Леанідавіч (24.4.1923, в. Дабрышчава Камсамольскага р-на Іванаўскай вобл., Расія — 20.7.1944), удзельнік вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў у Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1942. Разведчык асобнай разведроты сяржант З. 20.7.1944 у баі каля воз. Дрысвяты, прыкрываючы адыход разведчыкаў, быў цяжка паранены. Калі гітлераўцы акружылі яго, гранатай падарваў сябе і ворагаў.

В.Л.Зайцаў.

ЗА́ЙЦАЎ Вячаслаў Кандратавіч (18.9.1917, с. Ахлябініна, Башкартастан — 19.4.1992), бел. літаратуразнавец-славіст, перакладчык. Скончыў Ленінградскі ун-т (1951). У 1964—75 супрацоўнік Ін-та л-ры Нац. АН Беларусі. За публічныя эсхаталагічныя выступленні ў 1978 быў зняволены; у 1983 вярнуўся ў Мінск. Касмалагічныя заняткі (ідэі прышэльцаў з космасу), у якіх расчараваўся, прывялі З. да духоўна-хрысц. пошукаў. На Беларусі друкаваўся з 1966; пісаў на рус. мове. У 1969 пераклаў паэму І.Гундуліча «Асман» і выдаў манаграфію «Паміж Львом і Драконам» — даследаванне-каментарый да гэтай паэмы ў кантэксце Дуброўніцкага культ. працэсу. Даследаваў перадумовы гуманізму ў бел. л-ры, творчасць Ф.Скарыны.

Тв.: Богомильское движение и общественная жизнь Северной Италии эпохи Дученто. Мн., 1967.

ЗА́ЙЦАЎ Дзмітрый Яўгенавіч (н. 26.3.1940, Мінск), бел. кінааператар і рэжысёр. Засл. маст. Беларусі (1981). Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1969). Творчай манеры як аператара ўласцівы лірычная інтанацыя, майстэрская перадача атмасферы падзей, партрэтных характарыстык герояў: маст. фільмы «Іван Макаравіч» (1968, Гран пры «Сярэбраная Мінерва» 22-га Міжнар. кінафестывалю дзіцячых фільмаў у Венецыі, 1970; прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1970), «Нядзельная ноч» (1977), «Людзі на балоце» (1982, Дзярж. прэмія СССР 1984) і інш. З 1986 рэжысёр-пастаноўшчык («Усе кагосьці кахаюць», 1986; шматсерыйны «Хам», 1990, прыз за этнаграфію і нац. свое-

асаблівасці на конкурсе тэлефільмаў у Атаве, Канада, 1991, і яго кінаварыянт «Франка», Гран пры 2-га Еўрап. Міжнар. кінафестывалю ў Кадысе, Іспанія, 1991; «Кветкі правінцыі», 1995, і інш.). Дзярж. прэмія Беларусі 1996.

ЗА́ЙЦАЎ Іван Рыгоравіч (22.10.1916, в. Хоцімск Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 15.7.1952), поўны кавалер ордэна Славы. На фронце з 1941. Снайпер сяржант З. вызначыўся пры вызваленні Польшчы каля в. Юзэфаў Радамскага ваяв. і ў час прарыву абароны праціўніка на р. Одэр каля г. Лебус на тэр. Германіі, знішчыў 56 гітлераўцаў і захапіў 2 пушкі. Пасля вайны працаваў у калгасе на радзіме.

І.С.**Зайцаў**.

Я.А.**Зайцаў**.

ЗА́ЙЦАЎ Іван Сцяпанавіч (9.10.1926, в. Чонкі Гомельскага р-на — 16.4.1945), Герой Сав. Саюза (1945). У Вял. Айч. вайну з 1943 на 3-м Укр. і 1-м Бел. франтах. Камандзір аддзялення сяржант З. вызначыўся ў баі за ст. Вербіг на тэр. Германіі; цяжка паранены закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота, кулямётны агонь якога стрымліваў наступленне сав. воінаў.

ЗА́ЙЦАЎ Мар'ян Міхайлавіч (літ. псеўд. Мар'ян Віж; 23.2.1949, Мінск), бел. пісьменнік, гісторык. Скончыў БДУ (1971). Працаваў у Бел. т-ве аховы помнікаў гісторыі і культуры (1974—76), у БелСЭ (1976—79), у навук. і культ.-асв. установах Мінска, у штотыднёвіку «Наша слова» (1993—95), з 1995 у Ін-це сучасных ведаў. Друкуецца з 1974. У гіст. аповесці «Лабірынт» (1991), заснаванай на архіўных дакументах, паказаны падзеі на Беларусі ў час паўстання 1863—64. У аповесці «Гарадскія кветкі» (1995) спроба расказаць пра лёс адзінокага чалавека ў вял. горадзе (падзеі ў Мінску на мяжы 1970—80-х г.) У апавяданнях і навелах паглыбленая ўвага да набалелых праблем сучаснасці, іх повязей з айч. мінуўшчынай. Аўтар кн. гіст.-публіцыстычных нарысаў «Чары даўніны» (1989). У 1990 апублікаваў пралог гіст.-прыгодніцкага рамана «Здарэнне на Віленскім тракце». На бел. мову пераклаў кн. З.В. і С.Ф.Шыбекаў «Мінск. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада» (1994). Адшукаў у архіве і ў 1997 апублікаваў нар. драму М.Чарота «На Купалле», якая лічылася страчанай.

Тв.: Сялянскія хваляванні на Іўеўшчыне // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1980. № 2; Сялянскі рух у сярэдзіне XIX ст. // Тамсама. 1981. № 1; «Чтоб люд пробуждался...» // Нёман. 1988. № 3; Наш Менск, наш Минск // Тамсама. 1995. № 1; З пячаткай «Зямлі і волі» // Маладосць. 1989. № 3; Калейдаскоп сталічнай даўніны // Полымя. 1991. № 4.

І.У.Саламевіч.

ЗА́ЙЦАЎ Мікалай Якаўлевіч (н. 10.3.1923, чыг. ст. Крупкі Мінскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1945). Канд. філас. н. (1982). Скончыў 3-ю Чкалаўскую ваен. авіяц. школу пілотаў (1943), Акадэм. курсы афіцэрскага саставу ВМФ (1951), БДУ (1967). У Чырв. Арміі з 1941. У Вял. Айч. вайну з 1944 на 1-м і 4-м Укр. франтах. Удзельнік вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Нам. камандзіра эскадрыллі штурмавога авіяпалка З. зрабіў 185 баявых вылетаў, збіў 2 самалёты, знішчыў каля 20 танкаў, больш за 20 аўтамашын, 43 гарматы, 20 вагонаў. Да 1960 у Сав. Арміі. У 1967—95 выкладчык БДУ, дацэнт (1985).

ЗА́ЙЦАЎ Міхаіл Мітрафанавіч (н. 23.11.1923, в. Заводскі Хутар Тульскай вобл., Расія), военачальнік, ген. арміі (1980). Герой Сав. Саюза (1983). Скончыў ваен. акадэміі бранятанкавых войск (1954) і Генштаба (1965). У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 на Зах., Варонежскім, Бранскім, Цэнтр., 1-м Укр. франтах. Пасля вайны нач. штаба, камандуючы арміяй, 1-ы нам. камандуючага войскамі акругі. У 1976—80 камандуючы войскамі БВА. З 1980 галоўнакамандуючы Групай сав. войск у Германіі. З 1985 на кіруючых пасадах ва Узбр. Сілах СССР. Чл. ЦК КПБ у 1971—81, ЦК КПСС у 1981—90. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1971—80, СССР у 1979—89.

ЗА́ЙЦАЎ Юрый Канстанцінавіч (н. 22.1.1937, г. Барнаул, Расія), бел. мастак. Скончыў Маскоўскае вышэйшае маст. прамысл. вучылішча (1962). Творам уласціва шматпланавасць, экспрэсія, эмацыянальная насычанасць, багацце тэхн. і светлаколеравых вырашэнняў (жывапісныя творы «Спакуса», 1995, «Памяць», «Настальгія», «Натхненне», усе 1996, і інш.). Працуе ў станковай графіцы: «Хатынь» (1970; спец. прэмія на міжнар. выстаўцы «Супраць вайны» 1979 у г. Люблін, Польшча), «Трыумф касманаўтыкі» (1979), серыя «Вяртанне» (1982), «Партрэт В.Быкава» (1983), «Чарнобыльскі рэквіем» (1993); акварэлі: «Партрэт актрысы З.Белахвосцік» (1984), «Вясна на Беразіне» (1987), «Возера Свіцязь» (1991) і інш. Афарміў кнігі «Сярэбраная табакерка» З.Бядулі (1977), «Выбранае» Я.Купалы (на рус. мове, 1981; дыплом імя Ф.Скарыны на Рэсп. і дыплом 2-й ступені на Усесаюзным конкурсах кнігі, абодва 1982), «Асеннія гнёзды» С.Грахоўскага і «Антоній і Клеапатра» У.Шэкспіра (абедзве 1982) і інш.

ЗА́ЙЦАЎ Яўген Аляксеевіч (3.1.1908, г. Невель Пскоўскай вобл., Расія — 13.9.1992), бел. жывапісец. Нар. мастак Беларусі (1963). Чл.-кар. АМ СССР (1973). Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930), АМ у Ленінградзе (1937, вучыўся ў К.С.*Пятрова-Водкіна* і інш.). У 1943—44 удзельнічаў у афармленні бел. выданняў «Партызанская дубінка» і «Раздавім фашысцкую гадзіну». Працаваў пераважна ў станковым жывапісе. Шэраг сюжэтна-тэматычных карцін прысвечаны тэмам гісторыка-рэвалюцыйнай і Вял. Айч. вайны. Характэрны складанае кампазіцыйнае вырашэнне, манументальнасць, адлюстраванне гераікі падзей: «Чапаеў» (1937), «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск у 1920 годзе» (1940), «Пахаванне героя» (1946), «Стаяць насмерць» (1948), «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе» (1950), «Канстанцін Заслонаў» (1957), трыпціх «Мая рэспубліка ў агні Айчыннай»

Ю.**Зайцаў**. Спакуса. 1995.

(1963—67), «Незабыўнае» (1975). Узбагаціў жанр партрэта быт. і лірычнага плана: партрэты нар. артысткі БССР А.В.Нікалаевай (1943), свінаркі А.І.Чарняўскай (1954), пісьменнікаў М.Танка (1948), П.Броўкі, П.Глебкі (абодва 1968), К.Крапівы (1972), ткачыхі з в. Неглюбка М.П.Каўтуновай (1975), мастакоў А.А.Анікейчыка (1977) і З.Азгура (1983) і інш. Аўтар пейзажаў «Над Свіслаччу» (1945), «Лясная дарога» (1953), «Прыпяць» (1955), «Залаты вечар» (1975), нацюрмортаў. Адзін з аўтараў манум. размалёвак у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі (1940, 1958) і ў кінатэатры «Піянер» (1965) у Мінску.

Літ.: Герасимович П.Н. Е.А.Зайцев. М., 1980; Дробов Л.Н. Живопись Советской Белоруссии. Мн., 1979. *Г.А.Фатыхава.*

Я.Зайцаў. Ткачыха з вёскі Неглюбка М.П.Каўтунова. 1975.

ЗАЙЦЫ́ (Lepus), род млекакормячых сям. зайцавых атр. зайцападобных. Каля 23 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Амерыцы і Афрыцы. Найб. вядомыя З.: бяляк (L. timidus), русак (L. europaeus), талай (L. tolai). На Беларусі 2 віды: бяляк і русак.

Даўж. да 75 см, маса да 7 кг. Заднія канечнасці звычайна значна даўжэйшыя за пярэднія. Вушы доўгія, хвост кароткі. Размнажаюцца да 5 разоў за год. Дзіцяняты (2—8) нараджаюцца відушчыя, укрытыя поўсцю, здольныя адразу бегаць. Кормяцца травяністай расліннасцю, карой, пупышкамі, галінкамі дрэў і кустоў, сенам і інш. Аб'екты паляванння.

ЗАК Ісідар Аркадзевіч (н. 14.2.1909, г. Адэса, Украіна), расійскі дырыжор, педагог. Нар. арт. СССР (1976). Вучыўся ў Адэскай (1922—25, клас В.*Залатарова*), скончыў Ленінградскую (1928, клас М.*Малько*) кансерваторыю. У 1928—37 дырыжор у оперных т-рах Расіі, Казахстана, Украіны. Адзін з арганізатараў і дырыжор Чэлябінскага (1955—68) і Новасібірскага (1944—49 і з 1968 — галоўны) т-раў оперы і балета. Сярод спектакляў, пастаўленых пад яго кіраўніцтвам: оперы «Скупы рыцар» С.Рахманінава (1943), «Руслан і Людміла» (1944) і «Іван Сусанін» (1945) М.Глінкі, «Дударай» Я.Брусілоўскага (1956), «Далібор» (1950) і «Брандэнбуржцы ў Чэхіі» (1963) Б.Сметаны, «Мадам Бавары» Э.Бандэвіля (1982, упершыню), балет «Доктар Айбаліт» І.Марозава (1948). Выкладаў у Алма-ацінскай кансерваторыі (1952—55). Сярод вучняў Ф.Мансураў. Дзярж. прэмія СССР 1948.

ЗАК Якаў Ізраілевіч (20.11.1913, г. Адэса, Украіна — 27.6.1976), расійскі піяніст, педагог. Нар. арт. СССР (1966). Скончыў Адэскую кансерваторыю (1932) і аспірантуру Маскоўскай кансерваторыі (1935, кіраўнік Г.*Нейгаўз*). Выступаў як піяніст-канцэртант. Яго вялікі рэпертуар уключаў творы рус. і замежных кампазітараў-класікаў. Першы выканаўца многіх твораў сав. кампазітараў. З 1935 выкладаў у Маскоўскай кансерваторыі (з 1947 праф.). Сярод яго вучняў: Я.Магілеўскі, М.Пятроў, Э.*Вірсаладзе*. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў (1935), пераможца Міжнар. конкурсу піяністаў імя Ф.Шапэна (1937, Варшава, 1-я прэмія і спец. прыз — маска Шапэна).

Літ.: Яков Зак. Статьи. Материалы. Воспоминания. М., 1980.

«ЗАКАБЛУ́КА», бел. нар. парны танец. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Пары рухаюцца адна за адной па крузе. У аснове харэагр. малюнка — спалучэнне фігурнай праходкі з вальсападобнымі вярчэннямі. У цэнтры круга імправізацыйна танцавалі салісты. Танец суправаджаецца прыпеўкамі. У канцы 19 ст. бытаваў на Віцебшчыне, пра што згадвае этнограф П.В.Шэйн. Зафіксаваны таксама ў Гомельскай вобл.

Зайцы: 1 — бяляк, 2 — русак, 3 — талай (*а* — летам; *б* — зімой).

ЗАКА́ЗІК, горад у Егіпце, гл. *Эз-Заказік*.

ЗАКА́ЗНІК, участак прыроднай тэрыторыі, прызначаны для захавання і аднаўлення аднаго або некалькіх кампанентаў прыроды і падтрымання экалагічнага балансу; адзін з відаў *асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і аб'ектаў*. На тэр. З. пастаянна або часова забаронены ці абмежаваны пэўныя віды гасп. дзейнасці, якія могуць пашкодзіць яго стану (узворванне зямель, асобныя віды лесакарыстання, паляванне і рыбалоўства, касьба, выпас жывёлы, збор ягад, пладоў, кветак і інш.), у той жа час у З. могуць быць дазволены сан. высечка лесу, адлоў і адстрэл жывёл з навук. мэтамі, або для рэгулявання іх колькасці, лесапасадкі, рассяленне новых відаў жывёл, лесагасп. і інш. віды работ, турызм. Пл. З. ад некалькіх да сотняў тысяч гектараў, напр., Алма-ацінскі — 800 тыс. га (Казахстан), Верхнекандзенскі — 242 тыс. га і Кірзінскі — 120 тыс. га (Расія), Налібоцкі — 86 тыс. га (Беларусь).

На Беларусі (на 1.1.1998) створана 85 З. рэсп. значэння агульнай пл. 656 тыс. га і больш за 600 мясц. значэння. Асн. віды З.: *ландшафтныя заказнікі, біялагічныя заказнікі, гідралагічныя заказнікі* і палеанталагічныя. Першы З. — Белавежская пушча, створаны ў 1541 для аховы зуброў, з 1640 у ім забаронена высечка лесу.



Закамара.

ЗАКА́ЗНІК-ЖУРАВІ́ННІК, гл. ў арт. *Біялагічныя заказнікі*.

ЗАКАМА́РА, паўкруглае ці кілепадобнае завяршэнне часткі сцяны будынка паміж 2 лапаткамі, якое адпавядае форме ўнутр. скляпення (звычайна паўцыркульнага).

Найб. характэрны для візант. крыжова-купальнай сістэмы, у 10—13 ст. шырока выкарыстоўваліся ў стараж.-рус. (сафійскія саборы ў Кіеве, Ноўгарадзе і інш.), рус. архітэктуры 14—17 ст. (Успенскі сабор Маскоўскага Крамля).

На Беларусі З. вядомы ў 11—12 ст. у Сафійскім саборы і Спаса-Ефрасіннеўскай царкве ў Полацку, Барысаглебскай у Гродне, а таксама ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. ў храмах псеўдарус. стылю (цэрквы Аляксандра Неўскага ў Мінску, Сімяона ў Брэсце, у Камянцы, Бешанковічах і інш.).

ЗАКАНАДА́ЎСТВА, 1) адзін з асноўных метадаў ажыццяўлення дзяржавай сваіх функцый, які выяўляецца ў выданні органамі дзярж. улады законаў. 2) Сукупнасць прававых норм, якія рэгулююць грамадскія адносіны ў цэлым, або адзін з відаў грамадскіх адносін (цывільнае, крымін., зямельнае З. і г.д.). У Рэспубліцы Беларусь паняцце «З.» звычайна ўключае: Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, канстытуцыйныя законы, законы і пастановы Нац. сходу Рэспублікі Беларусь, дэкрэты, распараджэнні і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы СМ Рэспублікі Беларусь.

ЗАКАНАДА́ЎСТВА АБ АХО́ВЕ ПРЫРО́ДЫ, гл. *Прыродаахоўнае заканадаўства.*

ЗАКАНАДА́ЎСТВА АБ НЕ́ТРАХ, гл. ў арт. *Ахова нетраў.*

ЗАКАНАДА́ЎСТВА АБ ПРА́ЦЫ, гл. ў арт. *Ахова працы, Працоўнае права.*

ЗАКАНАДА́ЎЧАЯ ІНІЦЫЯ́ТЫВА, права ўнясення *законапраектаў* у заканадаўчыя органы, якое цягне за сабой абавязак гэтых органаў абмеркаваць законапраект і прыняць па ім рашэнне. Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь права З.і. належыць Прэзідэнту, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, Савету Рэспублікі, Нац. сходу Рэспублікі Беларусь, ураду, а таксама грамадзянам у колькасці не менш як 50 тыс. чал., якія валодаюць выбарчым правам. Рэалізуецца ў Палаце прадстаўнікоў.

ЗАКАНАДА́ЎЧАЯ ЎЛА́ДА, сістэма дзярж. органаў, якія маюць права выдаваць законы. У адпаведнасці з тэорыяй *раздзялення ўлад* адна з трох улад, якія ўраўнаважваюць у дзяржаве адна адну. У дэмакр. дзяржавах З.ў. можа ажыццяўляцца спец. заканадаўчымі органамі (парламент, мясц. заканадаўчыя асамблеі), а таксама і непасрэдна выбарчым корпусам (палітычна дзеяздольнымі грамадзянамі) шляхам *рэферэндуму*; ў некаторых выпадках і органамі выканаўчай улады — у парадку дэлегаванага заканадаўства. У Рэспубліцы Беларусь З.ў. належыць *Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь.*

«ЗАКАНАДА́ЎЧЫЯ А́КТЫ ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА XV—XVI стст.» («Законодательные акты Великого княжества Литовского XV—XVI вв.»), зборнік заканадаўчых і нарматыўных актаў, прывілеяў і суд. спраў ВКЛ. Выдадзены ў 1936 Ленінградскім ун-там. Змешчана больш за 20 дакументаў, у т.л. *Прывілей 1447, Судзебнік 1468*, Устава дзяржаўцам 1529, урыўкі з *«Уставы на валокі» 1557*, фрагменты Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588. Правапіс крыніц адаптаваны. У дадатку — кароткая храналагічная табліца па гісторыі ВКЛ, тлумачальны слоўнік.

ЗАКАПА́НЭ (Zakopane), горад на Пд Польшчы, у Новасандэцкім ваяв., каля падножжа Татраў. 30 тыс. ж. (1994). Харч. прам-сць. Тэатр, музеі (Татранскі, Я.Каспровіча, К.Шыманоўскага і інш.), маст. галерэі. Цэнтр традыц. нар. промыслаў (ткацтва, выраб карункаў, разьба па дрэве). Штогадовыя міжнар. фальклі. фестывалі. З 19 ст. развіваецца горна-кліматычны курорт. Буйнейшы ў Польшчы цэнтр круглагадавога адпачынку, турызму, альпінізму і зімовага спорту, а таксама кліматычнага лячэння хвароб органаў дыхання. Паблізу Татранскі нац. парк, горныя азёры, у т.л. Морске-Вока.

ЗАКАРПА́ЦКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. На З Украіны. Утворана 22.1.1946. Пл. 12,8 тыс. км². Нас. 1,3 млн. чал., гарадскога 41% (1996). Цэнтр — г. *Ужгарад*. Найб. гарады: Мукачава, Берагава, Вінаградаў, Хуст, Чоп.

Прырода. Размешчана на паўд.-зах. схілах Усх. Карпат і на паўд.-ўсх. ускраіне Сярэднедунайскай нізіны. Горы займаюць каля 80% тэр. Хрыбты Водападзельны (выш. да 1693 м), Паланінскі (да 1881 м), Вулканічны (да 1081 м) выцягнуты з ПнЗ на ПдУ. Ва ўсх. ч. знаходзяцца масівы Рахаўскі і Чарнагора (г. *Гаверла*, 2061 м) з альпійскімі формамі рэльефу. Карысныя выкапні: буры вугаль (Закарпацкі буравугальны раён), каменная соль, ртутныя і поліметал. руды, мармур, туф, андэзіт, мінер. вада. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. складае -1,7 °С на раўніне і -7,8 °С у гарах, ліп. адпаведна 19,2 °С і 13,8 °С. Гадавая колькасць ападкаў ад 600 мм на раўніне да 1400 мм у гарах. Гал. рака: Ціса (бас. р. Дунай) з вытокамі Чорная Ціса і Белая Ціса і прытокамі Цярэсва, Цярэбля, Рыка, Баржава, Уж, Латарыца. Глебы на нізінах пераважна дзярновыя і алювіяльныя, у перадгор'ях буразёмна-падзолістыя, у гарах бурыя горна-лясныя і горна-лугавыя. Лясы займаюць больш як 50% тэр. У перадгор'ях дубовыя і дубова-букавыя лясы, у гарах да 1100 м букавыя і мяшаныя, да 1600 м хвойныя, вышэй альпійскія лугі (паланіны), якія выкарыстоўваюцца як паша. На тэр З.в. *Карпацкі запаведнік.*

Гаспадарка індустрыяльна-агр. тыпу з развітой сферай турызму і санаторна-курортнага лячэння. Вядучыя галіны прам-сці: машынабудаванне і металаапрацоўка (прыборы, станкі, электрарухавікі), лясныя і дрэваапр. (мэблевая, фанерная, цэлюлозна-папяровая, лесахім.), харчасмакавая (вінаробчая, агароднінакансервавая, мясная, маласыраробчая, мукамольна-крупяная, тытунёвая), лёгкая (трыкатажная, футравая, абутковая, швейная). Вытв-сць буд. матэрыялаў (цагельна-чарапічная, каменедрабільная, кар'еры па здабычы туфу, мармуру). Здабыча бурага вугалю, каменнай солі. Народныя маст. промыслы (вырабы з дрэва, саломы, лазы, маёлікі). Ужгарадская і Рахаўская ЦЭС, Цярэбле-Рыкская ГЭС. На раўніне пасевы пшаніцы, кукурузы. Вінаградарства, пладаводства. Вырошчваюць агародніну, бульбу, з тэхн. культур — тытунь, сланечнік. Мяса-малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля. У перадгор'ях авечкагадоўля. Пчалярства. Па тэр. вобл. праходзяць чыгункі Чоп—Мукачава—Львоў, Чоп—Ужгарад—Львоў, Чоп—Рахаў—Івана-Франкоўск, аўтадарогі Ужгарад—Мукачава—Львоў, Ужгарад—Перачын—Львоў, Ужгарад—Рахаў—Івана-Франкоўск; нафтаправод «Дружба» і 3 газаправоды. Турызм. Закарпацкая і Сваляўская групы курортаў, курорт Сіняк. *П.І.Рогач.*

ЗАКАРПА́ЦКАЯ НІЗІ́НА, гл. *Закарпацце.*

ЗАКАРПА́ЦКАЯ УКРАІ́НА (Закарпацце), тэрыторыя сучаснай Закарпацкай вобл. Украіны. У 10—11 ст. была ў складзе Кіеўскай Русі. Стараж. насельніцтва — славяне. З 11 ст. ў складзе Венгрыі, потым Аўстрыі і Аўстра-Венгрыі, з 1919 — Чэхаславакіі, з 1938 — Венгрыі. З 1945 у складзе Украіны.

Горны ландшафт у **Закарпацкай вобласці.**

ЗАКАРПА́ЦЦЕ, 1) прыродная вобласць на ПдЗ Украіны, у бас. р. Ціса, на стыку Сярэднедунайскай раўніны і Карпат. У межах З. вылучаюцца Закарпацкая нізіна і перадгор'і Украінскіх Карпат. Значная частка тэр. ўзарана. Участкі дубова-грабавых лясоў. Гл. *Закарпацкая вобласць*. 2) Тое, што *Закарпацкая Украіна*.

ЗАКАРЫЯ́ДЗЕ Сярго (Сяргей) Аляксандравіч (1.7.1909, Баку — 13.4.1971), грузінскі акцёр. Нар. арт. СССР (1958). Вучыўся ў Тбіліскім ун-це. З 1928 акцёр Груз. т-ра імя К.Марджанішвілі, з 1956 — Т-ра імя Ш.Руставелі (абодва ў Тбілісі). Стварыў камед., рамантычна ўзнёслыя, з тонкім псіхалагізмам вобразы. Сярод лепшых роляў: Урыэль Акоста («Урыэль Акоста» К.Гуцкова), Лір («Кароль Лір» У.Шэкспіра), Крэонт («Антыгона» Ж.Ануя), Маленькі велікан («Чынчрака» Нахуцрышвілі) і інш. З 1934 здымаўся ў кіно: «Дзень апошні, дзень першы», «Бацька салдата» (Ленінская прэмія 1966) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1946, 1952 і Грузіі 1971.

Літ.: Твалчрелидзе Т., Церетели К. Серго Закариадзе // Актеры советского кино. М., 1967. Вып. 3.

ЗАКАЎКА́ЗЗЕ, частка Каўказа, якая ляжыць на Пд ад Галоўнага, або Водападзельнага, хрыбта Вял. Каўказа. Уключае б.ч. паўд. схіла Вял. Каўказа, Калхідскую і Кура-Араксінскую нізіны, Закаўказскае нагор'е, Талышскія горы і Ленкаранскую нізіну. У межах З. размешчаны асн. ч. Грузіі, Арменіі і Азербайджана.

ЗАКАЎКА́ЗСКАЕ НАГО́Р'Е, горная вобласць, якая ўключае паўн. ч. *Армянскага нагор'я*, *Малы Каўказ* і катлавіну сярэдняга цячэння р. Аракс.

ЗАКАЎКА́ЗСКАЯ ФЕДЭРА́ЦЫЯ, дзяржаўнае аб'яднанне сав. рэспублік Азербайджана, Арменіі і Грузіі ў 1922—36. З 12.3.1922 Федэратыўны Саюз Сацыялістычных Сав. Рэспублік Закаўказія (ФСССРЗ). З 13.12.1922 Закаўказская Сацыялістычная Федэратыўная Сав. Рэспубліка (ЗСФСР). З 30.12.1922 у складзе СССР. З 1936 закаўказскія рэспублікі ў складзе СССР як самаст. сав. рэспублікі. З 1991 суверэнныя дзяржавы.

ЗАКАЎКА́ЗСКІ КАМІСАРЫЯ́Т, орган дзярж. улады ў Закаўказіі ў 1917—18. Створаны 28.11.1917 у г. Тбілісі меншавікамі, эсэрамі, дашнакамі і мусаватыстамі пры падтрымцы краін Антанты. Кіраўнік Я.Гегечкоры. Праводзіў палітыку на адрыў Закаўказія ад Сав. Расіі. 26.3.1918 скасаваны *Закаўказскім сеймам*, выканаўчая ўлада перайшла да Закаўказскага часовага ўрада.

ЗАКАЎКА́ЗСКІ СЕЙМ, орган дзярж. улады ў Закаўказіі ў 1918. Скліканы *Закаўказскім камісарыятам* 23.2.1918 у г. Тбілісі з мэтай юрыдычна аформіць адрыў Закаўказія ад Сав. Расіі. Уваходзілі дэпутаты, выбраныя ад Закаўказія ва Установчы сход, прадстаўнікі партый меншавікоў, дашнакоў, мусаватыстаў і інш. З.с. аб'явіў сябе заканад. органам Закаўказія, у сак. 1918 санкцыяніраваў аддзяленне Закаўказія ад Сав. Расіі. 9.4.1918 абвясціў незалежнасць Закаўказскай дэмакр. федэратыўнай рэспублікі. Кіраўнік А.Чхенкелі. 26.5.1918 распушчаны.

ЗАКВА́СКІ, чыстыя культуры бактэрый (пераважна малочна-кіслых), дражджэй або плесневых грыбоў, якія выклікаюць *браджэнне* і выкарыстоўваюцца ў вытв-сці ў асн. харчовых прадуктаў. Мікраарганізмы, якія ёсць у З., трапляючы ў натуральны субстрат (малако, сумесь мукі з вадой, сок вінаграду і інш.), размнажаюцца, выклікаюць малочна-кіслае, прапіёнава-кіслае або спіртавое браджэнне і ўтвараюць араматычныя арган. рэчывы. З. ўжываюць для атрымання сыраквашы, ацыдафіліну, кумысу, кефіру, масла, некат. сартоў сыру, вінаграднага віна, кіслага хлеба, а таксама пры сіласаванні кармоў.

ЗАКІДНА́Я ТЭ́ХНІКА ў драўляным дойлідстве, спосаб узвядзення будынкаў і збудаванняў з асобных *праслаў*, зробленых з бярвён, брусоў, плашак, дыляў, дошак і інш., канцы якіх устаўлены ў шулы (вертыкальна пастаўленыя бярвёны або брусы з пазамі). На тэр. Беларусі вядома ў жытлах з каменнага веку. У 16 — пач. 20 ст. выкарыстоўвалася пераважна ў гасп., выгв. і некат. грамадскіх будынках (хлявы, аборы, гумны, адрыны, корчмы, крамы, склады, бровары і інш.), агароджах. У сядзібнай забудове часам замест драўляных шулаў выкарыстоўваліся мураваныя слупы. Цяпер З.т. выкарыстоўваюць у гасп. пабудовах на вёсцы.

ЗА́КІНТАС, Закінф, (Zakynthos), востраў у Іанічным м., самы паўднёвы ў групе *Іанічных астравоў*. Тэр. Грэцыі. Пл. 408 км². Аддзелены ад п-ва Пелапанес пралівам Закінтас (шыр. каля 20 км). Зах. палова вострава гарыстая (вапняковы масіў выш. да 756 м), зарослі маквісу і фрыганы; на У узгорыстая раўніна з садамі, вінаграднікамі, гаямі аліваў. Клімат міжземнаморскі, ападкаў да 1000 мм за год. Радовішча асфальту. Гал. горад і порт Закінтас.

ЗАКЛАД, гл. *Залог*.

ЗАКЛА́ДНІКІ, *цяглыя сяляне*, якія пераходзілі ў залежнасць да феадалаў, каб пазбавіцца ад цяжкіх падаткаў і павінасцей на карысць дзяржавы або злоўжыванняў уладнікаў. Яны трацілі асабістую свабоду, вымушаны былі плаціць феадалу натуральныя і грашовыя падаткі. Велікакняжацкія ўлады змагаліся супраць *закладніцтва*, бо яно змяншала колькасць дзярж. сялян і скарачала дзярж. даходы. У 15—16 ст. закладніцтва было пашырана у Полацкай зямлі.

ЗАКЛА́ДНІЦТВА, пераход дзярж. цяглых людзей да феадалаў у Рус. дзяржаве 13 — пач. 18 ст. Каб пазбавіцца цяжкіх дзярж. падаткаў і павіннасцей, збяднелыя сяляне і гараджане дамаўляліся («закладваліся») з феадаламі перайсці да іх, калі будуць зменшаны павіннасці. Пры гэтым закладнікі трацілі асабістую свабоду і траплялі ў залежнасць да феадала. Упершыню З. ўпамінаецца ў дагаворнай грамаце 1266 Ноўгарада з цвярскім князем. Урад, не задаволены памяншэннем даходаў ад скарачэння цяглых сялян, Судзебнікам 1550 забараніў гандл. людзям «закладвацца» за манастыры, а ў 1584 — свецкім феадалам прымаць закладнікаў. Пастановы 1619, 1638 абавязалі закладнікаў вярнуцца на старыя месцы. З. фармальна забаронена Саборным улажэннем 1649, аднак існавала да пач. 18 ст. Дакументы 15—16 ст. сведчаць пра існаванне З. і на Полацкай зямлі.

ЗАКЛЁПАЧНАЕ ЗЛУЧЭ́ННЕ, нераздымнае злучэнне дэталей з дапамогай заклёпак (метал. стрыжняў з закладнымі галоўкамі). Робіцца ўнахлёстку, ус-



Заклёпачнае злучэнне: *а* — схема злучэння (1, 2 — замыкальная і закладная галоўкі; 3 — стрыжань заклёпкі, 4 — дэталі, якія злучаюцца); *б* — пашыраныя тыпы заклёпак (1—3 — з патайной, паўпатайной, плоскай галоўкамі; 4 — канічная з падгалоўкам).

тык з адной або двума накладкамі. Выкарыстоўваецца ў канструкцыях, якія працуюць ва ўмовах ударных і вібрацыйных нагрузак, для змацавання дэталей, якія не зварваюцца або не дапускаюць награвання, і інш. З.з. выцясняюцца больш эканамічнымі зварнымі і клеявымі злучэннямі.

ЗАКЛІ́ЧКІ, абрадавыя песні магічнай функцыі са зваротам да аб'екта клічу. Найчасцей аб'ектам звароту выступалі поры года, святы (Вясна, Каляда, Купала), стыхіі, прыродныя з'явы (сонца, дождж, хмара), прадстаўнікі жывёльнага і раслінага свету. Заклінальны характар гэтых песень родніць іх з *замовамі*. Інтанацыя клічу найб. выразная ў вясновых З. Звароты да вясны ў першай страфе, дапоўненыя выгукамі «Гу!» ў канцы кожнай страфы, найб. поўна выяўляюць функцыян. прызначэнне гэтых З. Страта магічнай функцыі прывяла да пераходу некат. З. у дзіцячы фальклор.

Літ.: Барташэвіч Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мн., 1976; Довжэнок Г.В. Український дитячий фольклор: (Віршовані жанри). Київ, 1981; Мельников М.Н. Русский детский фольклор. М., 1987. *Г.А.Барташэвіч.*

ЗАКЛЮ́ЧНЫ АКТ НАРА́ДЫ ПА БЯСПЕ́ЦЫ І СУПРАЦО́ЎНІЦТВЕ Ў ЕЎРОПЕ, Хельсінкскі акт. Падпісаны 1.8.1975 у Хельсінкі кіраўнікамі урадаў 33 еўрап. дзяржаў, а таксама ЗША і Канады. У ім зафіксаваны да-

моўленасці, дасягнутыя на Нарадзе па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, у т.л. 10 прынцыпаў узаемаадносін паміж дзяржавамі (т.зв. Кодэкс мірнага суіснавання): суверэнная роўнасць, павага правоў, уласцівых суверэнітэту; непрымяненне сілы ці пагрозы сілай; непарушнасць граніц; тэр. цэласнасць дзяржаў; мірнае ўрэгуляванне спрэчак; неўмяшанне ва ўнутр. справы; павага правоў чалавека і асн. свабод; раўнапраўе і права народаў самастойна вызначаць свой лёс; супрацоўніцтва паміж дзяржавамі; добрасумленнае выкананне абавязкаў па міжнар. праве. *Л.М.Драбовіч.*

Б.**Закман**.

С.І.**Законнікаў**.

ЗА́КМАН (Sakman) Берт (н. 16.2.1942, г. Штутгарт, Германія), нямецкі ўрач і біяфізік. З 1974 у Ін-це біяфіз. хіміі М.Планка ў г. Гётынген (з 1989 Ін-т мед. даследаванняў, г. Гайдэльберг). Навук. працы па метадах фіксацыі эл. патэнцыялаў на клетачнай мембране і іх выкарыстанні для вывучэння будовы і функцый адзіночных іонных каналаў у розных тыпах клетак. Нобелеўская прэмія 1991 (разам з *Э.Неерам*).

ЗАКО́ВАНКА, Гулевіцкі канал, рака ў Калінкавіцкім і Мазырскім р-нах Гомельскай вобл., левы прыток р. Прыпяць. Даўж. 42 км. Пл. вадазбору 306 км^2. Пачынаецца за 2 км на ПнУ ад в. Лозкі Калінкавіцкага р-на, цячэ па раўніне Гомельскае Палессе. Асн. прыток — р. Дымарка (злева). Даліна невыразная, пойма асушаная. Рэчышча ад вытоку на працягу 38,5 км каналізаванае, шыр. яго ад 3 да 10 м.

ЗАКО́ЗЕЛЬ, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 13 км на ПдЗ ад горада і 8 км ад чыг. ст. Драгічын, 118 км ад Брэста. 767 ж., 310 двароў (1997). Спіртзавод. Клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам. Помнік архітэктуры — сядзіба (19 ст.). Каля вёскі — магіла ахвяр фашызму.

ЗАКО́Н, унутраная істотная і ўстойлівая сувязь з'яў, якая абумоўлівае іх развіццё і ўпарадкаванае *змяненне*. Паняцце З. блізкае да паняцця заканамернасці як сукупнасці ўзаемазвязаных па змесце законаў, якія забяспечваюць устойлівую тэндэнцыю або накіраванасць ў змяненні сістэмы. З. выяўляе і адзін з бакоў сутнасці (гл. *Сутнасць і з'ява*). У сістэме аб'ектыўнага ідэалізму ён трактуецца як выяўленне сусв. розуму, уласобленага ў прыродзе і грамадстве. З пункту погляду суб'ектыўнага ідэалізму З. прыўносіцца ў рэальны свет суб'ектам, які яго пазнае: розум дае законы прыродзе. Дыялект. матэрыялізм зыходзіць з таго, што З. мае аб'ектыўны характар, выражае рэальныя адносіны рэчаў і адлюстроўвае іх у свядомасці. На ранніх ступенях развіцця навукі ўстанаўліваліся эмпірычныя, або фенаменалагічныя З., якія выяўлялі сувязь паміж уласцівасцямі рэчаў і з'яў, што назіраліся пачуццёва (напр., *Бойля—Марыёта закон*). Тэарэт. З. раскрываюць глыбокія ўнутр. сувязі працэсаў, механізмы іх выкарыстання, уводзяць аб'екты (малекулы і атамы), што назіраюцца тэарэтычна. З пункту погляду дакладнасці прадказанняў адрозніваюць *статыстычныя і дынамічныя законы*. У залежнасці ад ступені агульнасці і сферы дзеяння адрозніваюць прыватныя, або спецыфічныя З., якія выражаюць сувязь паміж канкрэтнымі фіз., хім. або біял. ўласцівасцямі (напр., З. узаемасувязі масы і энергіі), і ўсеагульныя, або універсальныя З., якія выражаюць узаемасувязь паміж універсальнымі ўласцівасцямі і *атрыбутамі* матэрыі (напр., З. захавання і ператварэння энергіі, З. сусв. прыцягнення, З. дыялектыкі). Паміж агульнымі і прыватнымі законамі існуе дыялект. ўзаемасувязь: агульныя З. дзейнічаюць праз прыватныя, а апошнія уяўляюць сабой праяўленне агульных. Чалавек як звяно натуральнага працэсу сам падпарадкоўваецца З. гэтага працэсу. Але дзякуючы свайму веданню прыроды ён можа ўнутры вядомых межаў выкарыстоўваць у сваіх інтарэсах яе ўласныя заканамернасці. З. дапамагаюць людзям тлумачыць з'явы і працэсы рэчаіснасці, прымаць рашэнні і ажыццяўляць практычныя пераўтварэнні ў розных сферах дзейнасці.

С.Ф.Дубянецкі.

ЗАКО́Н (юрыд.), нарматыўна-прававы акт, прыняты вышэйшым прадстаўнічым органам дзярж. улады або шляхам усенар. галасавання (*рэферэндуму*). З. рэгулюе найб. важныя грамадскія адносіны, валодае вышэйшай юрыд. сілай у адносінах да нарматыўных актаў усіх інш. органаў дзяржавы. Ён складае аснову сістэмы права дзяржавы. Як саманст. крыніца права З. склаўся яшчэ ў старажытнасці і прыйшоў на змену прававому *звычаю*. Для З. характэрны асобы парадак прыняцця, спец. заканатворчая працэдура, якая распадаецца на шэраг стадый: *заканадаўчую ініцыятыву*, абмеркаванне праекта, прыняцце З., *абнародаванне закону*. Адрозніваюць канстытуцыйны З., які змяняе канстытуцыю, уносіць у яе папраўкі і дапаўненні або па сваёй сутнасці і важнасці рэгулюемых адносін прыраўноўваецца да канстытуцыі, і звычайны З., які выдаецца ў адпаведнасці з канстытуцыяй. Асн. З. дзяржавы з'яўляецца *канстытуцыя*. У федэратыўных дзяржавах адрозніваюць З. федэральныя і З. суб'ектаў федэрацыі. Асобную катэгорыю складаюць надзвычайныя З., якімі ў час абмежчанага ў краіне надзвычайнага становішча абмяжоўваюцца правы і свабоды грамадзян і правы юрыд. асоб (гл. *Надзвычайнае заканадаўства*).

ЗАКОНАПРАЕ́КТ, тэкст прапанаванага да прыняцця закону, падрыхтаваны для ўнясення на разгляд заканад. органа або на рэферэндум. Працэс падрыхтоўкі З. ўключае прыняцце рашэння аб падрыхтоўцы праекта, выпрацоўку яго тэксту, абмеркаванне і дапрацоўку першапачатковага праекта, узгадненне яго з усімі зацікаўленымі органамі і арг-цыямі. Пасля завяршэння падрыхтоўкі З. уносіцца на разгляд заканад. органа ў парадку *заканадаўчай ініцыятывы*.

ЗАКО́ННАСЦЬ, вяршэнства закону, няўхільнае выкананне законаў і адпаведных ім іншых прававых актаў усімі органамі дзяржавы, службовымі асобамі, грамадзянамі і грамадскімі арг-цыямі; адзін з элементаў дэмакратыі і прававой дзяржавы. Прынцып З. дэкларуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, паводле якой дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства. Прававыя акты або асобныя палажэнні, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку супярэчнымі Канстытуцыі, не маюць юрыд. сілы.

ЗАКО́ННІКАЎ Сяргей Іванавіч (н. 16.9.1946, в. Слабада Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БДУ (1969). Настаўнічаў, працаваў у прэсе, з 1978 у апараце ЦК КПБ, з 1986 гал. рэдактар час. «Полымя». Друкуецца з 1963. Паэзіі ўласцівы грамадз. пафас, публіцыстычнасць, любоў да роднай зямлі, адстойванне сапраўдных духоўных каштоўнасцей, увага да перажыванняў лірычнага героя ў спалучэнні з непрынятцем мяшчанства, спажывецкай маралі. У паэме «Чорная быль» (1990) успрыманне чарнобыльскай трагедыі як драмы народа, знаку катастрофы, болю ў яе сусв. апакаліпсічным вызначэнні. Аўтар зб-каў паэзіі «Бяседа» (1973), «Устань да сонца» (1976), «Пакуль жыве мая бяроза» (1981, Літ. прэмія імя А.Куляшова 1982), «Вера, Надзея, Любоў» (1983), «Прысак часу» (1986), «Сутнасць», «Вечная далеч» (абодва 1987), «Заклінанне» (1991, Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Купалы 1992), кніг эсэістычна-публіцыстычнай прозы «Беларускае сэрца» (1993), «Вячэра пад райскім дрэвам» (1996).

Тв.: Святая воля: Выбр. лірыка. Мн., 1993.

А.І.Сяменава.

ЗАКО́НЫ І ЗВЫ́ЧАІ ВАЙНЫ́, сукупнасць прынцыпаў і норм міжнар. права, якія рэгулююць адносіны паміж дзяржавамі па пытаннях, звязаных з вядзеннем вайны. Абмяжоўваюць выбар сродкаў і метадаў узбр. барацьбы, забараняюць выкарыстанне найб. жорсткіх з іх, устанаўліваюць крымін. адказнасць за

ваенныя злачынствы, чым аб'ектыўна садзейнічаюць абмежаванню маштабаў узбр. канфліктаў. Пачалі складвацца даўно. У 19 ст. прыняты першыя міжнар. акты аб правілах вядзення вайны. Агульнапрызнаныя З. і з.в. ўвасоблены ў *Гаагскіх канвенцыях* 1899, 1907, 1954, *Жэнеўскім пратаколе 1925* аб забароне выкарыстання на вайне ўдушлівых, ядавітых і інш. падобных газаў і бактэрыял. сродкаў, *Жэнеўскіх канвенцыях 1949* аб абароне ахвяр вайны, Канвенцыі 1980 аб забароне або абмежаванні некат. відаў звычайнай зброі, якія лічацца празмерна жорсткімі або маюць невыбіральнае дзеянне, у статутах і прыгаворах Нюрнбергскага і Такійскага Міжнароднага ваен. трыбуналаў.



Страха **закотам**: 1 — лемягі; 2 — латы.

ЗАКО́Т, старадаўняя канструкцыя страхі сял. хат і гасп. пабудоў на Беларусі. Бярвёны тарцовай сцяны вышэй верхняга вянка зруба паступова ўкарочваліся, сцяна набывала выгляд ступеньчатага трохвугольніка. На выступы клалі падстрэшныя жэрдкі-латы, якія служылі асновай *страхі*.

ЗАКРА́ІНА, паласа адкрытай вады паміж ледзяным покрывам і берагам. Утвараецца на рэках перад крыгаломам, а на морах і азёрах пры адрыве прыпаю ад берага пад уздзеяннем ветру, цячэнняў або ў выніку скразнога раставання лёду.

ЗАКРА́ЙКІ, палосы нерухомага тонкага лёду, якія ўтвараюцца ўздоўж берагоў рэк, азёр і вадасховішчаў пры незамёрзлым вадаёме. Першасныя З. ўзнікаюць восенню каля берагоў на мелкаводных участках з павольным цячэннем, наносныя — у выніку прымярзання да берагоў лёду, прынесенага ў час крыгаходу, рэшткавыя застаюцца каля берагоў вясной пры раставанні лёду.

ЗАКРО́ЙНАЯ МАШЫ́НА, раскройная машына, машына для выразання дэталей швейных вырабаў са слаёў (насцілу) палотнаў тканіны, трыкатажу або інш. матэрыялаў. Вышыня насцілу — да 30 см. Рэжучы інструмент у перасоўных З.м. — стальны пласціністы нож, які робіць верт. зваротна-паступальны рух, або вярчальны дыск; у стацыянарных — бясконцая стальная стужка-нож, нацягнутая на шківы. Укараняюцца лазерныя З.м.

ЗАКРУ́ТАЧНАЯ МАШЫ́НА, машына для герметычнага закрывання кансервавых бляшанак і слоікаў. Асн. частка З.м. — закрутачны механізм, які абкочвае закрутачныя ролікі вакол слоіка (бляшанкі). Пры абкочванні ролікі дэфармуюць накрыўку і ўтвараюць падвойнае шво ў бляшанцы ці шчыльнае злучэнне са слоікам. Адрозніваюць З.м. вакуумныя і бязвакуумныя, адна- і шматшпіндэльныя, аўтам. і паўаўтаматычныя. Аўтам. З.м. за мінуту апрацоўваюць да 500 бляшанак або да 200 слоікаў.

ЗАКРУ́ТКІН Віталій Аляксандравіч (27.3.1908, г. Феадосія, Украіна — 9.10.1984), рускі пісьменнік. Скончыў Благавешчанскі пед. ін-т (1932). Друкаваўся з 1926. Першая аповесць «Акадэмік Плюшчоў» (1940). Творы ваен. часу ў кнігах «Карычневая чума» (1941), «Сіла» (1942), «Каўказскія запіскі» (1947). Працоўныя будні рыбакоў у рамане «Плывучая станіца» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1951). Аўтар рамана-эпапеі «Стварэнне свету» (кн. 1—3, 1955—78, Дзярж. прэмія СССР 1982), рамана «Ля мора Азоўскага» (1946), аповесці «Маці Чалавечая» (1969; на бел. мову ўрывак пераклаў У.Шахавец) і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. Ростов н/Д, 1977—80; Бел. пер. — у кн.: Квітней, Радзіма, красуй, жыццё. Мн., 1978.

Літ.: Петелин В.В. Виталий Закруткин М., 1969.

ЗАКРЫ́ТАЕ МО́РА ў міжнародным праве, мора, якое абмываюць берагі некалькіх дзяржаў і па сваім геагр. становішчы не можа быць выкарыстана для транзітнага праходу праз яго ў інш. мора. Доступ з адкрытага мора ў закрытае ажыццяўляецца па вузкіх марскіх шляхах, якія вядуць толькі да берагоў дзяржаў, размешчаных вакол З.м. Паводле канцэпцыі З.м. ў яго не павінны дапускацца ваен. караблі непрыбярэжных краін.

ЗАКРЭ́ЎСКІ Аркадзь Дзмітрыевіч (н. 22.5.1928, С.-Пецярбург), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1972), д-р тэхн. н. (1967), праф. (1969). Скончыў Томскі ун-т (1956). З 1971 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па тэорыі дыскрэтных сістэм, тэарэт. асновах інфармац. тэхналогій і інтэлектуальных сістэм праектавання. Распрацаваў метады лагічнага праектавання дыскрэтных прылад, рашэння лагічных ураўненняў і камбінаторных задач аўтаматызаванага праектавання і штучнага інтэлекту.

Тв.: Логический синтез каскадных схем. М., 1981; Логика распознавания. Мн., 1988.


Перасоўная **закройная машына** з вертыкальным нажом.

ЗАКС (Sachs) Нэлі (10.12.1891, Берлін — 12.5.1970), нямецкая паэтэса. У 1940 эмігравала ў Швецыю. Аўтар

А.Дз.**Закрэўскі**.

Н.**Закс**.

зб-каў «У жыллі смерці» (1947), «Зорнае зацьменне» (1949), «І ніхто не ведае далей» (1957), «Уцёкі і ператварэнне» (1949), «Смерць яшчэ святкуе жыццё» (1961), 14 п'ес (зб. «Знакі на пяску», 1962). Нобелеўская прэмія 1966.

Тв.: Рус. пер. — Звездное затмение. М., 1993.

ЗА́КУПЫ, катэгорыя залежнага сялянства ў Кіеўскай Русі і ВКЛ. 1) Паводле Рускай Праўды З. станавіліся збяднелыя сяляне, якія бралі ў феадала грашовую пазыку («купу») і павінны былі працаваць у яго гаспадарцы, пакуль не вернуць яе. У адрозненне ад поўных *халопаў* З. маглі звярнуцца ў суд са скаргамі на пана, з дазволу пана пайсці на пошукі грошай. У выпадку продажу З. у халопы без законных падстаў пан плаціў штраф, а З. станавіўся вольным. 2) У ВКЛ 14—16 ст. З. — даўжнікі феадалаў, якія закладвалі сваю асобу ў няволю, пакуль не адпрацуюць доўг у гаспадарцы пана. З сярэдзіны 16 ст. з запрыгоньваннем асн. масы сялянства З. паступова знікаюць.

ЗАКУШНЯ́К Аляксандр Якаўлевіч (10.3.1879, г. Адэса, Украіна — 21.4.1930), артыст эстрады, заснавальнік жанру «вечары апавяданняў». Сцэнічную дзейнасць пачаў у 1906 як драм. акцёр. З 1910 выступаў з канцэртамі, як аўтар, рэжысёр і выканаўца твораў л-ры з эстрады: «Паўстанне анёлаў» А.Франса, «Егіпецкія ночы» А.Пушкіна, «Тарас Бульба» М.Гогаля, «Кашюша Маслава» паводле Л.Талстога, «Прыніжаныя і зняважаныя» Ф.Дастаеўскага і інш.

ЗАЛ, у міфалогіі каўказска-іберыйскіх народаў (лакцаў, цахураў, рутульцаў, аварцаў, татаў) вярхоўны бог. Лічылася, што З. жыве на небе, ён вечны, усёвідушчы, усёмагутны, усёпераможны і літасцівы ўладар неба і зямлі. Ад яго залежыць дабрабыт на зямлі; сумленных і добрых людзей ён робіць багатымі, бессардэчных і прагных — жабракамі, пазбаўляючы іх розуму. З распаўсюджаннем ісламу З. сталі атаясамліваць з *алахам*.

ЗА́ЛА СПАРТЫЎНАЯ, гл. ў арт. *Спартыўна-гімнастычная зала*.

ЗАЛАЖЭ́ННЕ СХІ́ЛАЎ, залажэнне гарызанталей, адлегласць паміж дзвюма сумежнымі гарызанталямі на тапаграфічнай карце або плане, што дазваляе вызначыць стромкасць схілаў у патрэбным месцы без назіранняў на мясцовасці. Залежыць ад стромкасці схілаў і прынятай для карты вышыні сячэння. Чым больш стромы схіл на мясцовасці, тым меншая адлегласць паміж гарызанталямі на карце (пры аднолькавай вышыні сячэння).

ЗАЛА́ЗЫ, другая назва балота *Астравы-Дулебы*.

ЗАЛАТАВО́ЧКІ (Chrysopidoe), сямейства насякомых атр. сеткакрылых. Каля 800 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды і Новай Зеландыі. Трапляюцца часцей на лісці дрэў і кустоў. На Беларусі найчасцей трапляюцца З. звычайная (Chrysopa carnea) і З. жамчужная (Ch. perla).

Даўж. 1—1,5 см. Цела светла-зялёнае. Крылы празрыстыя, светлыя, вясёлкава- або перламутрава-пералівістыя (размах 19—50 мм), з густой сеткай жылак. Вусікі ніткападобныя. Вочы выпуклыя, залацістыя (адсюль назва). Адкладваюць яйцы на лісце раслін. Лічынкі падоўжаныя, верацёнападобныя, зверху па баках пучкі валаскоў. Лічынкі і дарослыя — драпежнікі, кормяцца тлямі, шчытоўкамі, вусенямі, кляшчамі, некат. — нектарам. Актыўныя ўначы.

ЗАЛАТАГО́РАЎ Уладзімір Рыгоравіч (н. 30.5.1931, с. Стараюр'ева Тамбоўскай вобл., Расія), бел. вучоны-эканаміст. Канд. эканам. н. (1966), праф. (1991). Скончыў Ленінградскую лесатэхн. акадэмію (1954). Працаваў нач. лесапункта, гал. інжынерам леспрамгаса. З 1965 у Бел. дзярж. тэхнал. ун-це (з 1996 заг. кафедры эканомікі і кіравання на прадпрыемствах хіміка-лясnога комплексу). Даследуе праблемы сац.-эканам. эфектыўнасці прамысл. вытв-сці, капітальных укладанняў і новай тэхнікі. Аўтар эканам. слоўнікаў і даведнікаў, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Энциклопедический словарь по экономике. Мн., 1997.

ЗАЛАТАГУ́ЗКА (Euproctis chrysorrhoea), матыль сям. ваўнянак. Пашыраны ў Еўропе, М. Азіі, Паўн. Афрыцы і Паўн. Амерыцы. На Беларусі часам назіраецца масавы лёт у садах, парках, лісцевых лясах.

Крылы ў размаху да 3,5 см, афарбоўка белая, на пярэдніх крылах зрэдку чорныя кропкі; на канцы брушка пучок залацістых валасковатых (адсюль назва). Яйцакладкі (на лісці) прыкрываюцца валаскамі. Шаравата-чорныя вусені даўж. да 3,5 см, бародаўчатыя, з пякучымі валаскамі, якія пры сутыкненні з імі выклікаюць моцнае раздражненне скуры і слізістых абалонак. Зімуюць групамі (па 200—300) у гнёздах з лісця. Знішчаюць пупышкі і лісце пладовых і лясных лісцевых дрэў.

ЗАЛАТАРО́ВА Марыя Міхайлаўна (17.9.1907, г. Вазнясенск, Украіна — 14.2.1979), бел. вучоны ў галіне афтальмалогіі. Д-р мед. н. (1951), праф. (1952). Скончыла Адэскі мед. ін-т (1930). У 1951—54 заг. кафедры Віцебскага мед. ін-та. З 1954 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў. Навук. працы па лячэнні эпідэмічнага кан'юнктывіту, па вызначэнні афтальмалагічных прыкмет пры розных хваробах.

Тв.: Офтальмологические симптомы при различных заболеваниях организма. Мн., 1965; Офтальмологические симптомы при болезнях ЛОР-органов и полости рта. Мн., 1969; Избранные разделы клинической офтальмологии // Офтальмалогия. Мн., 1973.

ЗАЛАТАРО́Ў Васіль Андрэевіч (7.3.1872, г. Таганрог, Расія — 25.5.1964), рускі і бел. кампазітар, педагог. Засл. арт. Расіі (1932), нар. арт. Беларусі (1949). Праф. (1918). Вучыўся ў Прыдворнай пеўчай капэле ў М.*Балакірава* і А.*Лядава*, скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1900, клас М.*Рымскага-Корсакава*). У 1909—33 выкладаў у кансерваторыях і муз.-драм. ін-тах у Расіі і на Украіне, у 1933—41 — у Бел. кансерваторыі. Творча развіваў рэаліст. традыцыі рус. класічнай музыкі. Напісаў шэраг твораў на матэрыяле фальклору розных народаў, у т.л. ўкр., узб., малд., туркм. і інш. У бел. муз. культуру арганічна ўвайшлі яго балет па матывах нар. легенд «Князь-возера» (паст. 1949, Дзярж. прэмія СССР 1950; на тую ж музыку паст. балеты «Аповесць пра каханне», 1953, і «Палымяныя сэрцы», 1955); сімфонія «Беларусь» (4-я, 1934), танц. сюіта і увертюра-фантазія на бел. тэмы (1937) для сімф. арк.; Маленькая сюіта на тэмы зах.-бел. нар. песень для хору а капэла (1943); цыкл апрацовак нар. песень для голасу з сімф. арк. «Кантрасты» (1939). Сярод інш. твораў: опера «Дзекабрысты» (паст. 1925), 4 кантаты, 6 сімфоній, 6 стр. квартэтаў і інш. Аўтар манаграфіі «Фуга» (1932) — першай рус. працы, спецыяльна прысвечанай гэтай муз. форме.

Літ. тв.: Воспоминания... М., 1957; Фуга. 3 изд. М., 1965.

Літ.: Нисневич С. В.А.Золотарев. М., 1964. *С.Г.Нісневіч.*

В.А.**Залатароў**.

ЗАЛАТАРО́Ў (Іваноў) Карп Іванаў (?—1698), жывапісец і залатапісец у Маскоўскай дзяржаве. Паходзіў з Беларусі. У канцы 1650-х г. працаваў у Нова-Іерусалімскім манастыры каля Масквы, потым «жалаваны» жывапісец Маскоўскай Аружэйнай палаты. Выконваў (з І.Безміным) жывапісныя творы для Церамнога палаца Маскоўскага Крамля, размалёўваў слупы ў Пакроўскім саборы і печы ў царскіх харомах с. Ізмайлава, Троіцкую праязную вежу-браму ў Крамлі, іканастас Сергіеўскай царквы с. Вараб'ёва. Аўтар партрэта патрыярха Іаакіма (1678), абразоў «Пакуты божыя», «Уваскрэсенне Хрыста», «Пакровы Маці Божай», харугваў з карцінамі «Уваскрэсенне Хрыста» і «Успенне Багародзіцы» для Страснога манастыра ў Маскве. Удзельнічаў у стварэнні іканастасаў царквы Успення Багародзіцы ў трапезнай Новадзявочага манастыра (1685), Вял. сабора Данскога манастыра ў Маскве (1698) і інш. Намаляваў на паперы «12 месяцаў і бегі нябесныя», прапісваў золатам чарцяжы і тэкст рукапіснай кнігі «Пра млынавую будову». Меў вучняў.

ЗАЛАТАРЭ́НКА Іван Нічыпаравіч (?—7.10.1655), паплечнік Б.*Хмяльніцкага*. Нежынскі палкоўнік (з 1653). З 1654 наказны гетман укр. казацкага 20-тысячнага войска (Нежынскі, Стародубскі і Чарнігаўскі палкі). У час *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* пасланы на Беларусь у распараджэнне цара Аляксея Міхайлавіча. У 1654 заняў Гомель, Рэчыцу, Жлобін, Стрэшын, Рагачоў, Прапойск, Чачэрск і Новы Быхаў, у 1655 — Бабруйск, Глуск, Каралеўскую Слабаду, Свіслач, Койданава, разам з рас. войскамі ўдзельнічаў у захопе Мінска і Вільні. Загінуў у час *Быхава аблогі 1654—55*.

ЗАЛАТАЦВЕ́Т, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Хрызантэма*.

ЗАЛАТА́Я АРДА́ (Улус Джучы), феад. дзяржава на тэр. Сярэдняй Азіі і Усх.

Залатагузка: 1 — матыль; 2 — вусень; 3 — пашкоджанае лісце.

Еўропы ў 13—15 ст. Узнікла ў пач. 1240-х г. Займала тэр. Зах. Сібіры, Паўн. Харэзма, Волжскай Булгарыі, Паўн. Каўказа, Крыма, стэпаў ад Волгі да Дуная; трымала ў васальнай залежнасці рус. землі. Напачатку займала зах. ч. імперыі Чынгісхана — тэр. ўдзельнага княства (улуса) яго сына Джучы (адсюль адна з назваў З.А.). Самаст. дзяржавай стала пры Батыі, сыне Джучы. Усх. ч. улуса Джучы (Зах. Сібір) атрымала назву Блакітнай Арды. Батый у выніку паходаў 1236—40 далучыў да сваіх уладанняў Паволжа, кіпчацкія стэпы (гл. *Дэшт-і-Кіпчак*), Паўн. Каўказ, Крым, Харэзм, пакарыў рус. княствы. У сярэдзіне 13 ст. хан Берке [1258—66] прыняў іслам і не стаў прызнаваць вярх. улады мангольскага хана. Напачатку сталіцай З.А. быў г. Сарай-Бату (каля сучаснай Астрахані), з 1-й пал. 14 — г. Сарай-Берке (каля сучаснага Валгаграда). Пра ператварэнне З.А. ў самаст. дзяржаву сведчыць чаканка манеты з імем 5-га хана Менгу-Цімура [1267—80]. Пасля яго смерці ў выніку міжусобных войнаў перамагла частка арыстакратыі мусульм. веравызнання. Яна вылучыла на ханскі пасад Узбека [1313—42], унука Менгу-Цімура. Пры Узбеку і яго сыне Джанібеку [1342—57] З.А. стала адной з вял. дзяржаў сярэдневякоўя. У выніку шматлікіх прыдворных змоў і смут З.А. фактычна распалася ў 1370-я г. на 2 часткі: у раёнах на З ад Волгі правіў цемнік Мамай, ва ўсх. раёнах — Урус-хан. Унутр. бязладдзе З.А. скарысталі маскоўскія князі. У *Кулікоўскай бітве 1380* войскі Мамая пацярпелі паражэнне. Часовае аднаўленне адзінства З.А. адбылося пры хане *Тахтамышу*, які ў 1380 разбіў Мамая на р. Калка, а праз 2 гады заняў і спаліў Маскву. Але правіцель Сярэдняй Азіі Тамерлан (*Цімур*) у 1391 і 1395 разбіў войскі Тахтамыша, разрабаваў сталіцу. На гэтым скончылася адзінства З.А.



Апошнюю спробу аб'яднаць дзяржаву ў пач. 15 ст. зрабіў *Едыгей*. Складаныя працэсы феад. дрbalення прывялі ў 2-й пал. 15 ст. да распаду З.А. на Казанскае, Астраханскае і Крымскае ханствы, *Нагайскую Арду* і ўласна *Вялікую Арду*.

Адносіны ВКЛ з З.А. на працягу многіх стагоддзяў былі складаныя. Вясною 1238 манґола-татары пагражалі ВКЛ з У. У канцы 1246 яны ўварваліся на тэр. ВКЛ з Пд, зрабілі вял. спусташэнні. Захаваліся летапісныя звесткі пра жорсткія бітвы з татарамі дружын з Пінска, Слоніма, Навагрудка, Турава, Друцка і інш. гарадоў. Упартая працяглая барацьба і гераічная абарона сваіх зямель насельніцтвам ВКЛ аслабілі і падарвалі сілы заваёўнікаў. Князі ВКЛ не толькі абаранілі свае землі, але і наладзілі саюз з ханамі З.А. супраць агульных праціўнікаў. Вял. князі Гедзімін, Вітаўт і інш. запрашалі татар З.А. на дапамогу ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам. Татары ўдзельнічалі ў вайне Гедзіміна супраць крыжакоў у 1319; у 1350 ардынскія атрады прымалі ўдзел у паходзе вял. князя Кейстута ў Польшчу. У 1397 пасля сумеснага паходу на Азоў шмат татар пасялілася каля Вільні, у Ашмянскім, Брэсцкім, Лідскім, Навагрудскім паветах. У 1409 да Вітаўта прыбыў з 30-тысячным войскам сын Тахтамыша царэвіч Джэлал-ад-дзін, які прымаў удзел у *Грунвальдскай бітве 1410* супраць Тэўтонскага ордэна. Сярод цюркскіх народаў ВКЛ мела славу надзейнага прыстанішча. Тут знайшлі прытулак многія звергнутыя ханы.

Літ.: Егоров В.Л. Историческая география Золотой Орды в XIII—XIV вв. М., 1985; Яго ж. Золотая Орда: мифы и реальность. М., 1990.

І.Б.Канапацкі.

Медаль **«Залатая Зорка»**.

ЗАЛАТА́Я БУ́ЛА (лац. Bulla aurea, венг. Aranybulla), 1) адзін з важнейшых юрыд. актаў у сярэдневяковай Венгрыі. Выдадзена ў 1222 венг. каралём Андрашам II Арпадам пад націскам т.зв. каралеўскіх слуг (пазней з іх сфарміравалася сярэдняя шляхта). З.б. гарантавала ім правы, якія да гэтага мелі магнаты (бароны): вызваленне ад падаткаў, права судаводства ў камітатах, абмежаванне абавязку ваен. службы і інш.; прадстаўляла вышэйшай і сярэдняй шляхце права паўстання супраць караля ў выпадку парушэння ім булы (адменена ў 1687). 2) Пастанова, прынятая ў 1356 у «Свяшчэннай Рым. імперыі» на імперскіх сеймах у гарадах Нюрнберг і Мец, зацверджаная імператарам Карлам IV Люксембургскім у якасці асн. канстытуцыйнага акта. Рэгулявала парадак выбрання імператара *курфюрстамі*, устанаўлівала час і месца выбарчага з'езду, вызначала рангі, абавязкі і прывілеі курфюрстаў. Дзейнічала да 1806.

«ЗАЛАТА́Я ЗО́РКА», медаль, якая ўручалася асобам, удастоеным звання *Героя Савецкага Саюза*, з 1965 — гарадам-героям і крэпасцям-героям. Уведзена 1.8.1939 (да 16.10.1939 наз. «Герой Савецкага Саюза»). Уяўляе сабой залатую 5-канцовую зорку з гладкімі двухграннымі прамянямі на правым баку. Уручалася разам з ордэнам Леніна.

ЗАЛАТА́Я РО́ЗГА, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Сумнік*.

ЗАЛАТА́Я РЫ́БА (лац. Dorado), сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркая зорка 3,3 візуальнай *зорнай велічыні*. У З.р. знаходзіцца Вял. Магеланава Воблака — спадарожнік Галактыкі. На тэр. Беларусі не відаць. Гл. *Зорнае неба*.

ЗАЛАТА́Я РЫ́БКА (Carassius auratus auratus), падвід сярэбранага карася.

Прызначана для ўтрымання ў дэкар. вадаёмах і акварыумах. Пашырана ўсюды. У Кітаі разводзяць з 10—12 ст., у Расію завезена ў канцы 17 ст. Зыходная форма з прэсных вадаёмаў Кітая, дзе З.р. выведзена шляхам працяглага адбору жоўтых і чырв. мутантных форм. Ад зыходнай формы адрозніваецца залаціста-жоўтай афарбоўкай, больш кароткім і шырокім (да шарападобнага) тулавам, вельмі зменены плаўнікамі. Атрыманы сотні парод і форм рознай афарбоўкі, памераў тулава, галавы, плаўнікоў, велічыні і размяшчэння вачэй і інш. прыкмет. Найб. вядомыя жамчужына, ільвінагалоўка, камета, вадзяныя вочкі, тэлескоп, шубункін і інш.

ЗАЛАТО́Е ВО́ЗЕРА, гл. *Цялецкае возера*.

ЗАЛАТО́Е ЗАБЕСПЯЧЭ́ННЕ, залогавыя каштоўнасці ў выглядзе *залатога запасу*, якія выкарыстоўваюцца цэнтр. банкамі для забеспячэння выканання ўзятых абавязацельстваў і пакрыцця банкнот. У сувязі з ліквідацыяй функцыі золата як грошай эканам. значэнне З.з. змяншаецца, яно адыгрывае перважна ролю часткі *залатавалютных рэзерваў* краіны.

«ЗАЛАТО́Е КАЛЬЦО́ РАСІ́І», турысцкі маршрут, які ўключае стараж. гарады Уладзімір, Суздаль, Пераслаўль-Залескі, Растоў, Угліч, Яраслаўль, Кастраму, Сергіеў Пасад і інш. Пачынаецца звычайна з Масквы, праходзіць па Маскоўскай, Уладзімірскай, Іванаўскай, Яраслаўскай і Кастрамской абласцях. Працягласць больш за 1000 км. На «З.к.Р.» помнікі рус. гісторыі і культуры, якія складаюць яе «залаты фонд» (адсюль назва) і маюць сусв. значэнне. Усе гарады «З.к.Р.» развіваюцца як цэнтры турызму. Помнікі Уладзіміра, Суздаля, арх. ансамбль Троіца-Сергіевай лаўры ў Сергіевым Пасадзе ўключаны ЮНЕ́СКА у спіс Сусветнай спадчыны.

ЗАЛАТО́Е РУНО́, у грэчаскай міфалогіі залатая воўна барана. Паводле міфаў, Нефела, жонка цара Фіваў Афаманта, атрымала барана ад Гермеса і аддала сваім дзецям Фрыксу і Геле. На спіне гэтага барана Фрыкс прыбыў (Гела па дарозе загінула) да цара Ээта ў Калхіду, дзе ахвяраваў жывёлу Зеўсу, а скуру барана павесіў у гаі Арэса. Потым З.р., якое ахоўваў дракон, укралі *аргенаўты*. У пераносным сэнсе З.р. — багацце, якім імкнуцца завалодаць.

ЗАЛАТО́Е СЯЧЭ́ННЕ, залатая прапорцыя, гарманічнае дзяленне, дзяленне адрэзка на 2 часткі, пры якім меншая частка адносіцца да большай, як большая да ўсяго адрэзка. Тэрмін «З.с.» ўвёў Леанарда да Вінчы (канец 15 — пач. 16 ст.). Алг.

Залатая рыбка (2) і яе пароды: 1 — стракаты тэлескоп; 3 — жамчужына; 4 — шубункін; 5 — ільвінагалоўка; 6 — камета.

Залатое сячэнне х/а адрэзка АВ.





$$\frac{B}{C} = \frac{C}{A}$$

Залатое сячэнне.

ЗАЛАТНІ́К, старажытная мера (адзінка) *масы*. Назва паходзіць ад златніка — стараж. рус. залатой манеты масай 4,2 г. Лікавае значэнне З. ў 16—19 ст. мянялася: у ВКЛ З. = 3,9 г (прыблізна), у Беларусі ў 19 — пач. 20 ст. З. = $^1/_{96}$ фунта = 4,266 г. З. карысталіся пры вызначэнні пробы каштоўных металаў.

ЗАЛАТНІ́К у т э х н і ц ы, рухомае аўтаматычнае прыстасаванне (клапан), якое накіроўвае паток рабочай вадкасці, пары або газу ў патрэбны канал шляхам свайго зруху адносна адпаведных адтулін (акон). Бываюць каробчатыя, цыліндрычныя і кранавыя. Выкарыстоўваюцца ў цеплавых, гідраўлічных, пнеўматычных машынах і механізмах, у сістэмах гідраўтаматыкі і інш. З. наз. таксама паветраны незваротны клапан аўтамаб. шыны.





Залатнікі: *а* — каробчаты (1 — каробка, 2 — цяга, 3 — вокны, 4 — поласць); *б* — кранавы (1 — камеры, 2 — вокны, 3 — утулка, 4 — вось, 5 — каробка).

вызначэнне З.с. адрэзка даўжынёй *а* зводзіцца да рашэння ўраўн. $a/x=x/(a-x)$ (гл. *Гарманічная прапорцыя*). Дзель x/a можна набліжана выявіць дробамі 2/3, 3/5, 5/8, 8/13, 13/21, ..., дзе 2, 3, 5, 8, 13, 21, ... — лікі Фібаначы. З.с. сустракаецца ў «Асновах» Эўкліда (3 ст. да н.э.). Прынцыпы З.с. выкарыстоўваюцца ў архітэктуры (асабліва антычнай эпохі Адраджэння) і выяўл. мастацтве.

ЗАЛАТУ́ХА, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр Чкалаўскага с/с. За 50 км на ПнУ ад г. Калінкавічы, 98 км ад Гомеля, 12 км ад чыг. ст. Васілевічы, 661 ж., 288 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі *Залатухінскае радовішча нафты.*

ЗАЛАТУ́ХІН Юрый Дзмітрыевіч (н. 2.6.1932, г. Кіраваград, Украіна), бел. вучоны ў галіне буд-ва. Канд. тэхн. н. (1968), праф. (1991). Скончыў Адэскі гідратэхн. ін-т (1956). З 1967 у Бел. дзярж. ун-це транспарту (г. Гомель). Навук. працы па даследаванні і выпрабаванні жалезабетонных канструкцый, рэканструкцыі і павелічэнні эксплуатацыйнай надзейнасці збудаванняў.

Тв.: Испытание строительных конструкций. Мн., 1983; Испытание сооружений. Мн., 1992 (у сааўт.).

ЗАЛАТУ́ХІНСКАЕ РАДО́ВІШЧА НА́ФТЫ, у Калінкавіцкім і Рэчыцкім р-нах Гомельскай вобл., каля в. Залатуха. Уваходзіць у *Прыпяцкі нафтагазаносны басейн.* Адкрыта ў 1972, распрацоўваецца з 1973. Паклады нафты пл. 15,6 км^2 прымеркаваны да міжсалявых і падсалявых адкладаў на Пн Прыпяцкага прагіну, у межах Маладушынскай зоны падняццяў. Глыб. залягання нафтаносных гарызонтаў 1950 — 3615 м. Пароды-калектары — кавернава-трэшчынаватыя мергелі, вапнякі, даламіты. Нафта лёгкая, малавязкая, маласярністая, высокасмалістая, парафінавая, з удз. в. 0,84—0,87 г/см^3. *А.П.Шчураў.*

ЗАЛАТЫ́ ВЕК, у старажытных уяўленнях многіх народаў самая ранняя пара існавання чалавецтва, калі людзі заставаліся вечна маладыя, не ведалі турбот і засмучэнняў, былі падобныя да багоў, але падуладныя смерці, якая прыходзіла да іх як салодкі сон. З.в. называюцца таксама час росквіту культуры, мастацтва, л-ры, навукі і інш. Адпаведна гіст. працэсам развіцця ў розных краінах перыяды З.в. не супадаюць храналагічна і тыпалагічна. Для Беларусі некат. даследчыкі З.в. называюць 16 — 1-й пал. 17 ст., што прыпадае на бел. *Адраджэнне.*

ЗАЛАТЫ́ ЗАПА́С, цэнтралізаваны рэзервовы фонд золата ў злітках і манетах, які належыць дзярж. казначэйствам або цэнтр. банкам, а таксама міжнар. валютна-крэдытным арг-цыям. З 1970-х г. практычна замарожаны; выкарыстоўваецца ў некаторых выпадках як забеспячэнне крэдытаў замежных дзяржаў або міжнар. арг-цый, а краінамі, што сталі на шлях развіцця, — для атрымання замежнай валюты шляхам продажу металу на рынках золата, аўкцыёнах, фін. органам інш. краін. Пэўная частка дзярж. З.з. вылучаецца для прам-сці або прадаецца прыватным асобам (як правіла, у выглядзе залатых манет). Асн. частка З.з. ў сярэдзіне 1990-х г. прыпадала на прамыслова развітыя краіны (77% ад сусветных), на 130 краін, што сталі на шлях развіцця (13%). У першай пяцёрцы па З.з. знаходзіліся ЗША — 8,1 тыс. т, Германія — 3,7 тыс. т, Францыя — 3,2 тыс. т, Італія — 2,6 тыс. т, Швейцарыя — 2,6 тыс. т (усяго 20,2 тыс. т). Агульныя сусв. афіцыйныя З.з. ў 1980 складалі 35,8 тыс. т, у 1994 — 34,2 тыс. т. Гл. таксама *Золатавалютныя рэзервы.*

В.А.Драздоў.

«ЗАЛАТЫ́ ПУЛ», спецыяльная міжнар. арг-цыя, створаная ў 1961 ЗША і 7 заходнееўрап. краінамі для правядзення сумесных аперацый на Лонданскай залатой біржы з мэтай стабілізацыі рыначнай цаны золата на ўзроўні яго афіц. цаны. Выступала за міждзярж. рэгуляванне цаны на золата. З.п. распаўся ў 1968. Са спыненнем абмену долара ЗША на золата ў 1971 афіц. рынак золата практычна перастаў існаваць.

ЗАЛАТЫ́ РОГ, 1) бухта каля еўрап. берага праліва Басфор. Даўж. 12,2 км, шыр. 91—122 м, глыб. да 47 м. На берагах г. Стамбул (Турцыя). 2) Бухта ў заліве Пятра Вялікага (Японскае м.). Даўж. 7 км. Шыр. каля ўвахода больш за 2 км. Глыб. 20—30 м. На берагах горад і порт Уладзівасток (Расія).

ЗАЛАТЫ́ СТАНДА́РТ, грашова-валютная сістэма, заснаваная на золаце як грашовым тавары. Упершыню быў афармлены ў Вялікабрытаніі ў канцы 18 ст., але шырокае развіццё атрымаў у канцы 19 ст. З.с. выступаў у форме золатаманетнага, залатазліткавага і золатадэвізнага. Золатаманетны стандарт характарызаваўся свабоднай чаканкай і абарачэннем залатых манет, разменам грашовых сродкаў на залатыя манеты, вывазам і ўвозам золата. З пачаткам 1-й сусв. вайны золатаманетны стандарт практычна перастаў існаваць (у ЗША да 1934). Залатазліткавы стандарт, які ўзнік пасля вайны, прадугледжваў толькі размен грашовых сродкаў на залатыя зліткі, а золатадэвізны — на замежную валюту (долары і фунты стэрлінгаў). Пасля сусв. эканам. крызісу 1929—33 абмен на залатыя зліткі захавалі толькі ЗША у адносінах з афіц. органамі інш. краін. У 1971 гэты абмен быў спынены і З.с. перастаў існаваць.

В.А.Драздоў.

ЗАЛАТЫ́Я ВАРО́ТЫ (Golden Gate), праліў, які яднае бухту Сан-Францыска на зах. беразе ЗША з Ціхім ак. Даўж. 8 км, шыр. 1,5—3 км, глыб. да 43 м. На паўн. беразе — фарты, на паўд. — г. Сан-Францыска. Цераз праліў пабудаваны ў 1937 вісячы мост даўж. 3100 м.

ЗАЛАТЫ́Я ПЯСКІ́, Златні-Пясцы, прыморскі кліматычны курорт у Балгарыі. На беразе Чорнага м., за 17 км на ПнУ ад г. Варна. Спрыяльныя прыродныя ўмовы (марскі клімат, мяккая зіма, гарачае сонечнае лета з марскімі брызамі, пляжы з дробным залаціста-жоўтым пяском) забяспечваюць эфектыўную клімата- і таласатэрапію неспецыфічных хвароб органаў дыхання, сардэчна-сасудзістай, апорна-рухальнай і нерв. сістэм, нырак, абмену рэчываў. Вял. прыродны парк, летні т-р, непадалёку стараж. манастыр Аладжа (засн. ў 3 ст.).

ЗАЛАТЫ́Я РУ́ДЫ, прыродныя мінеральныя ўтварэнні, якія маюць у сабе золата Au у выгаднай для здабычы колькасці. Выяўлена больш за 30 мінералаў золата. Асн. прамысл. значэнне мае *золата самароднае*, менш значныя кюстэліт (каля 10—20% Au) і тэлурыды. Акрамя ўласна З.р. вядомы золатазмяшчальныя руды інш. металаў (медзі, нікелю, серабра, цынку, жалеза, марганцу). Паводле генезісу З.р. падзяляюцца на эндагенныя, экзагенныя (россыпы) і метамарфізаваныя. Практычна ўсе эндагенныя З.р. гідратэрмальнага паходжання і маюць золата ад 2—3 г да некалькіх соцень грам на тону пароды. Утвараюць масіўныя плітападобныя жылы (радовішчы Украіны, Казахстана, Ганы, Канады і інш.), сульфідныя жылы (радовішчы Расіі, Аўстраліі), паклады і трубападобныя целы (радовішчы Узбекістана, ЗША). Паводле саставу пераважаюць золата-сульфідна-кварцавыя і золата-кварцавыя З.р. Пробнасць золата ў іх 700—900. Экзагенныя З.р. знаходзяцца пераважна ў россыпах, радзей — у зонах акіслення золатазмяшчальных сульфідных радовішчаў. У россыпах З.р. прадстаўлены рыхлымі або слабасцэментаванымі прыпаверхневымі адкладамі, якія ўтвараюць рудныя пласты і струмені. Золата ў іх знаходзіцца ў выглядзе абкатаных і паўабкатаных зерняў, лусак, зросткаў з кварцам, самародкаў. Колькасць Au ад 100 мг/м^3 да дзесяткаў грам у кубічным метры пароды, пробнасць 800—950. У зонах акіслення канцэнтрацыя золата ад 2—3 да 10 г/т. З.р. тут у выглядзе гнёздаў, лінзаў ці пакладаў складанай формы. Метамарфагенныя З.р. звязаны з пластамі залатаносных канглямератаў або гравелітаў (радовішчы ПАР, Ганы, Бразіліі і інш.). Золата ў іх у выглядзе зерняў змяшчаецца ў цэменце, трапляецца і ў форме тонкіх пражылак, якія сякуць кварцавую гальку. Колькасць 3—20 г/т, пробнасць больш за 900. Запасы золата ў свеце размяркоўваюцца вельмі нераўнамерна. На Беларусі вядомы толькі рудапраяўленні Au у россыпах і ўкрапанні ў пародах крышт. фундамента.

У.Я.Бардон.

ЗА́ЛАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, у Астравецкім р-не Гродзенскай вобл., у бас. р. Сарачанка, за 34 км на ПнУ ад г.п. Астравец. Уваходзіць у *Сарачанскую групу азёр.* Пл. 0,24 км^2, даўж. 870 м, найб. шыр. 370 м, найб. глыб. 12,6 м, даўж. берагавой лініі 2,6 км. Пл. вадазбору 140 км^2. Схілы катлавіны ў выглядзе озавых град і камавых узгоркаў выш. 10—14 м, пад лесам, на У разараныя. Берагі на Пн і ПдЗ нізкія, забалочаныя, пад хмызняком. Мелкаводная зона вузкая, пясчаная, глыбакаводная — сапрапелістая, з упадзінамі. Праз возера цячэ р. Клевель (злучае яго з азёрамі Туравейскае і Каймін).

ЗАЛАЦІ́СТЫ СЯВЕ́Ц, гл. *Сявец залацісты.*

ЗАЛАЦІ́СТЫЯ ВО́ДАРАСЦІ (Chrysophyta), аддзел ніжэйшых раслін; прадстаўнікі фітапланктону. Каля 120 родаў. Больш за 400 відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў прэсных водах; характэрны для кіслых вод сфагнавых балот; жывуць у морах і салёных азёрах, зрэдку ў глебе. Планктонныя, эпіфітныя, бентасныя арганізмы. З'яўляюцца важным звяном трафічнага цыкла вадаёмаў (першасныя прадуцэнты арган. рэчываў). На Беларусі 21 род, каля 50 відаў, напр., гіялобрыян, дынобрыян, кефірыян, маламонас, сінура, стэнакалікс, ураглена, урагленопсіс, хрызідаліс, тылахрызіс і інш.

Залацістыя водарасці: 1 — гідрурус; 2 — сінура.

Аднаклетачныя, каланіяльныя, радзей шматклетачныя арганізмы рознай формы. Рухомыя, плаваюць свабодна або прымацоўваюцца. Колер залаціста-жоўты, часам бурава-та-зялёны, радзей зеленавата-жоўты з-за хларафілу, жоўтых пігментаў (караціноідаў, фукаксанціну). Кветкі рознай формы, аднаядравыя, без цвёрдай абалонкі, некат. ў крэменязёмным лускавінкавым панцыры з іголкамі, шыпамі або ў «хатцы» (своеасаблівы панцыр). Маюць 1—2 (3—4) жгуцікі, скарачальныя вакуолі і вочка. Хларапластаў 1—2, пасценныя, карытападобныя. Запасныя рэчывы — хрызаламінарын і алей. Размнажэнне вегетатыўнае, бясполае (зааспорамі, аўтаспорамі), палавое (іза-, гола-, аўтагамія). Большасць відаў аўтатрофы, ёсць гетэратрофы. Пры неспрыяльных умовах утвараюць крамяністыя цысты.

ЗАЛАЧЭ́ННЕ, пакрыццё вырабаў, асобных частак прылад, канструкцый, збудаванняў тонкім слоем *залата* з дэкаратыўнымі, ахоўнымі і ахоўна-дэкаратыўнымі мэтамі. Выкарыстоўваецца ў ювелірнай і гадзіннікавай вытв-сці, паўправадніковай тэхніцы, ужытковым мастацтве і інш.

Ліставое З. — наклейванне на падрыхтаваную паверхню вырабаў або збудаванняў тонкіх (0,1—0,3 мкм) лістоў золата. Вядома з 3-га тыс. да н.э. (Егіпет), у Кіеўскай Русі пашырылася з 10—11 ст. Ужывалася для аддзелкі палацаў і храмаў. У паліграфіі выкарыстоўваецца для спец. мастацкага друкавання і ціснення пераплётаў. Парашковае З. — нанясенне на выраб, пакрыты клейкім лакам, тонкага слоя залатога парашку. Агнявое З. — пакрыццё метал., звычайна медных, лістоў амальгамай (сплаў золата і ртуці) з наступнай адгонкай ртуці нагрэвам. Другі яго спосаб — нанясенне лаку, у якім ёсць золата, на фарфора-фаянсавыя вырабы. Пры абпальванні лак выгарае, а залатое покрыва застаецца. З. плакіроўкай — гарачая пракатка лістоў золата з лістамі інш. металу або валачэнне метал. пруткоў, абкручаных лістамі золата. Гэтым спосабам вырабляюць біметал для карпусоў гадзіннікаў і інш. Гальванічнае З. (выкарыстоўваецца з сярэдзіны 19 ст.) робіцца пераважна ў цыяністых залатых электралітах метадам *электралітычнага асаджэння*. З. катодным распыленнем пашырана пры вытв-сці фотаэлементаў і інш. З. наз. таксама пакрыццё прадметаў рэчывамі залацістага колеру.

ЗАЛА́ШКА Міхаіл Валянцінавіч (н. 21.11.1929, г. Грозны, Чэчэнская Рэспубліка), бел. вучоны ў галіне мікрабіялогіі. Д-р біял. н. (1972), праф. (1974). Засл. дз. н. Беларусі (1990). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію імя К.А.Ціміразева (1953). З 1965 у Ін-це мікрабіялогіі Нац. АН Беларусі, у 1975—82 адначасова ў Бел. тэхнал. ін-це. Навук. працы па фізіялогіі мікраарганізмаў і біятэхналогіі ў галіне ліпідагенезу дражджэй. Распрацаваў навук. асновы атрымання новых кармавых і лячэбна-прафілакт. прэпаратаў, абгрунтаваў тэарэт. канцэпцыю пра ўмовы сінтэзу ліпідаў 2 тыпаў у клетцы. Дзярж. прэмія Эстоніі 1985.

Тв.: Биосинтез липидов дрожжами. Мн., 1971; Экстрацеллюлярные продукты метаболизма дрожжей. Мн., 1979 (разам з Г.А.Підоплічка); Биотехнология переработки молочной сыворотки. М., 1990.

ЗА́ЛЕ, рака ў Германіі, гл. *Заале*.

ЗАЛЕ́ЖСКІ Уладзімір Мікалаевіч (19.9.1880, с. Ачы, Татарстан — 2.2.1957), рэвалюцыянер, адзін з кіраўнікоў рэв. руху на Палессі. З 1900 вёў парт. дзейнасць у Казані, Ніжнім Ноўгарадзе, Астрахані, Царыцыне, Кіеве і інш. У 1910—12 у Навазыбкаве і Гомелі кіраваў экспедыцыяй у Расію з-за мяжы нелегальнай парт. л-ры. Удзельнічаў у аднаўленні дзейнасці і быў чл. *Палескага камітэта РСДРП(б)*. У 1902—04, 1913—15, 1916—17 у турмах і ссылках. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 чл. Рус. бюро ЦК і Выканаўчай камісіі Пецярб. к-та РСДРП(б). Дэлегат VII (Красавіцкай) канферэнцыі і VI з'езда РСДРП(б). У дні Кастр. рэвалюцыі камісар Петраградскага ВРК, потым чл. калегіі Наркамата і нам. наркома пошт і тэлеграфаў. З 1918 у Чырв. Арміі. З 1922 на навук і пед. рабоце.

ЗАЛЕ́ННЕ, аперацыя падрыхтоўкі шкуры да *дублення* ў гарбарнай вытв-сці. Робяць воднымі суспензіямі гашанай вапны з сульфатам натрыю (радзей з інш. рэчывамі) у спец. апаратах (тыпу бетоназмяшальнікаў). У выніку З. растваряюцца волас і эпідэрміс ці аслабляецца іх сувязь з дэрмай, што дазваляе без пашкоджанняў ачысціць шкуру ад воласу. У выніку З. атрымліваюць паўфабрыкат — галлё.

ЗАЛЕ́НСКІ Уладзімір Уладзіміравіч (7.2.1847, в. Шахварастоўка Палтаўскай вобл., Украіна — 26.10.1918), расійскі заолаг, эмбрыёлаг. Акад. Пецярбургскай АН (1897; чл.-кар. 1893). Скончыў Харкаўскі ун-т (1867). З 1871 праф. Казанскага, з 1882 — Новарасійскага (г. Адэса) ун-таў. Дырэктар з 1897 Заалаг. музея Пецярбургскай АН і адначасова з 1901 Севастопальскай біястанцыі. Навук. працы па параўнальнай эмбрыялогіі нерв. сістэмы беспазваночных і рыб. Распрацоўваў параўнальна-эмбрыялагічны кірунак, створаны работамі І.І.*Мечнікава* і А.А.*Кавалеўскага*.

ЗАЛЕ́СКАЯ Галіна Адамаўна (н. 28.2.1937, в. Кімейка Сенненскага р-на Віцебскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1987), праф. (1993). Чл. Нью-Йоркскай АН (1995). Дачка А.І.*Залескага*. Скончыла БДУ (1959), дзе і працавала да 1966. З 1966 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це атамнай і малекулярнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па малекулярнай спектраскапіі і лазернай фізіцы. Распрацавала метады даследаванняў электроннай і вагальнай рэлаксацыі шмататамных малекул, метады і сродкі газавага аналізу тэхнал. працэсаў і навакольнага асяроддзя.

Тв.: Энергетические зависимости характеристик столкновительного обмена колебательной энергией в парах многоатомных молекул (разам з Дз.Л.Якаўлевым) // Оптика и спектроскопия. 1995. Т. 78, № 2. *М.П.Савік.*

ЗАЛЕ́СКІ Адам Іосіфавіч (н. 4.4.1912, в. Кімейка Сенненскага р-на Віцебскай вобл.), бел. гісторык, этнограф. Д-р гіст. н. (1963), праф. (1964). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1940). У 1937—40 нам. дырэктара Мінскага пед. вучылішча. З 1945 выкладчык, дэкан Курскага пед. ін-та. З 1953 заг. сектара этнаграфіі Ін-та гісторыі, з 1957 нам. дырэктара Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У 1970—81 навук. супрацоўнік, заг. сектара Ін-та гісторыі АН БССР. Аўтар прац па гісторыі Вял. Айч. вайны, нац. адносін. Адзін з аўтараў 5-томнай «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 4, 1975), «Нарысаў ваеннай гісторыі Беларусі» (ч. 1—5, 1995).

Тв.: Быт беларускіх сялян у партызанскім краі. Мн., 1960; В партизанских краях и зонах. М., 1962; Героический подвиг миллионов в тылу врага. Мн., 1970; Дарогамі партызанскай Беларусі. Мн., 1974; О национальных отношениях в Советской Белоруссии: Ист. очерки. Гродно, 1992 (разам з П.М.Кобрынцам).

ЗАЛЕ́СКІ Аляксандр Ксаверавіч (1891, в. Баяры Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. — 24.11.1937), дзяржаўны дзеяч БССР. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. З 1913 у арміі. У кастр. 1917 удзельнік узбр. паўстання ў Харкаве, потым старшыня ЧК пры Харкаўскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З 1918 у Беларусі, адзін з арганізатараў падп. бальшавіцкай арг-цыі, партыз. атрадаў у Навагрудскім пав., старшыня Замір'еўскага падп. падрайкома РКП(б), Сноўскага рэўкома. З 1919 старшыня Навагрудскага пав. ВРК, чл. Навагрудскага пав. к-та КП(б)ЛіБ, у Чырв. Арміі. З 1924 у Наркамаце земляробства БССР, з 1936 нам. наркома. Беспадстаўна рэп-

рэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957. Аўтар успамінаў. *Э.А.Карніловіч.*

ЗАЛЕ́СКІ Аляксандр Яфімавіч (н. 17.1.1939, Мінск), бел. матэматык. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1991), д-р фіз.-матэм. н. (1978), праф. (1986). Скончыў БДУ (1960). З 1960 у Ін-це матэматыкі Нац. АН Беларусі. З 1997 праф. ун-та ў Вялікабрытаніі (г. Новіч). Навук. працы па тэорыі лінейных і алгебраічных груп, тэорыі кольцаў, тэорыі інварыянтаў. Вырашыў праблему Капланскага пра групавыя кольцы, праблему Фейса пра нётэравыя кольцы. Даследаваў уласцівасці асобных элементаў у камплексных прадстаўленнях канечных груп тыпу Лі і ідэалах групавых кольцаў лакальна канечных груп.

А.Я.Залескі.

Тв.: Об одном предположении Капланского // Докл. АН СССР. 1972. Т. 203, № 4; Фрагмент матрицы разложения специальной унитарной группы над конечным полем // Изв. АН СССР. Сер. мат. 1990. Т. 54, № 1.

ЗАЛЕ́СКІ Антон Ігнатавіч (15.2.1824, Варшава — 4.10.1885), мастак, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64 у Польшчы, Беларусі і Літве. Адукацыю атрымаў у Вільні і Варшаве, жывапісу вучыўся ў Вене і Фларэнцыі. Працаваў як мастак-графік, ілюстраваў творы А.Міцкевіча, Т.Ленартовіча, А.Мальчэўскага, І.Ходзькі і інш. Чл. Віленскай археал. камісіі. У 1862 прыхільнік «чырвоных», увайшоў у *Літоўскі правінцыяльны камітэт*, дзе разам з К.Каліноўскім рыхтаваў паўстанне. 26.1.1863 арыштаваны і высланы ў Вятку. З 1867 у Варшаве, потым за мяжой. *Г.В.Кісялёў.*

ЗАЛЕ́СКІ Барыс Андрэевіч (н. 6.7.1953, г. Кяхта, Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1990). Скончыў Маскоўскі ун-т (1979). З 1982 у Ін-це матэматыкі Нац. АН Беларусі, адначасова ў БДУ. У 1994—96 ва ун-це г. Білефельда (Германія). Навук. працы па статыстыцы шматмерных размеркаванняў, лімітавых тэарэмах тэорыі імавернасцей.

Тв.: Точность гауссовской аппроксимации в банаховых пространствах // Теория вероятностей и ее применение. 1989. Т. 34, вып. 4. *М.П.Савік.*

ЗАЛЕ́СКІ Браніслаў Францавіч (21.6.1820, мяст. Вызна Слуцкага пав., цяпер г.п. Чырвоная Слабада Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 2.1.1880), бел. і польскі мастак, пісьменнік. Чл.-кар. АН у Кракаве (1873). За ўдзел у нелегальных студэнцкіх гуртках у час вучобы ў Дэрпцкім ун-це (1840-я г.) у 1846 арыштаваны, у 1847 сасланы ў Арэнбург, потым у Хіву, Туркестан. Разам з Т.Р.*Шаўчэнкам* (перапісваўся з ім у 1853—59) удзельнічаў як мастак у экспедыцыях па Аральскім краі і ў горы Каратау. У 1856 вярнуўся на радзіму, у в. Рачкавічы, дзе стварыў шэраг пейзажаў; жыў у в. Дарава каля Баранавічаў, у Мінску, каля Гродна (1857—59). Рабіў малюнкі да «Віленскага альбома» Я.Вільчынскага, які выдаваўся ў 1848—60-я г. У пач. 1860-х г. эмігрыраваў за мяжу (Дрэздэн, Рым, Парыж), дзе стварыў афорты «Калізей у Рыме» (1864), «Від Сан-Мало». Памагаў паўстанцам 1863—64 у закупцы зброі. Сакратар Гісторыка-літ. т-ва і рэдактар яго «Штогоднікаў» (з 1866, Парыж), выпусціў ілюстраванае (22 афорты) выданне «Жыццё кіргізскіх стэпаў» (1865), «Польскія выгнаннікі ў Арэнбургу»

Б.**Залескі**. Серакоўскі ў турме. Малюнак. 1863.

(1866), а таксама ўспаміны пра сучаснікаў. Аўтар прац «Адмена прыгонніцтва ў Літве» (1868), «З жыцця літвінкі» (пра мастачку А.Скірмунт, 1876) і інш. Стварыў шэраг малюнкаў пра паўстанне 1863—64 («Серакоўскі ў турме», 1863, і інш.), пейзажаў («Паток у Ціролі»). Сябраваў з Ц.Норвідам, быў адрасатам яго паэт. ліста «Да Браніслава З.». Перапісваўся з А.І.Герцэнам.

Тв.: (Из заметок Шевченко). // Т.Г.Шевченко в воспоминаниях современников. М., 1962.

Літ.: Александровіч С. Старонкі братняй дружбы. Мн., 1960. С. 173—181.

ЗАЛЕ́СКІ ПАЛА́ЦАВА-ПА́РКАВЫ АНСА́МБЛЬ, помнік палацава-паркавай архітэктуры 18—19 ст. у в. Залессе (Смаргонскі р-н). Належаў роду князёў Агінскіх, з 1802 — М.Клеафасу *Агінскаму*. Складаўся са старой сядзібы 1-й пал. 18 ст. ў стылі барока (не захавалася) і новага палацава-паркавага ансамбля ў стылі класіцызму (1802—05). Сядзіба ўключала сядзібны дом, невял. парк, гасп. двор і сад. Сядзібны дом — 1-павярховы прамавугольны ў плане драўляны будынак з 4 алькежамі па вуглах. Побач размяшчаўся парк, 2-павярховая драўляная брама вяла ў гасп. двор з кухняй, свірнам, лядоўняй. На тэр. сядзібы быў стаў з млыном, за ім — гасп. пабудовы і сад. Новы палацава-паркавы ансамбль пабудаваны на тэр. паміж абалонай р. Вілія і старой сядзібай паводле праекта арх. М.Шульца з удзелам арх. Ю.Пусэ. Палац — 1—2-павярховы мураваны Г-падобны будынак. Гал. прамавугольны ў плане корпус мае сіметрычна-восевую кампазіцыю з 2-павярховымі бакавымі павільёнамі і цэнтр. часткай, вылучанай 4-калонным дарычным порцікам і вежачкай з гадзіннікам. У інтэр'еры вестыбюля збераглісь арнаментальная фрэскавая размалёўка і кафляныя грубкі. Да гал. фасада прымыкалі 2 аранжэрэі і сад. Побач з палацам стаяла 8-гранная капліца, аздобленая арх. жывапісам. Каля палаца размяшчаўся шпацырны звярынец з 2

Залескі палацава-паркавы ансамбль. З малюнка Л.Ходзькі. 1822.

альтанкамі, за ім — парк у рамантычным стылі (пашкоджаны ў гады 1-й сусв. вайны), дзе ўстаноўлены памятны камень у гонар Т.Касцюшкі. За ракой знаходзіўся звярынец. Вядуцца работы па рэстаўрацыі і аднаўленні арх. аблічча ансамбля.

Літ.: Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Вторая пол. XVIII — начало XIX в. Мн., 1981; Трэпет Л.В. Там, дзе гучалі паланезы. Мн., 1990. *Л.В.Іванова.*

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 17 км ад горада і чыг. ст. Глыбокае, 217 км ад Віцебска. 254 ж., 111 двароў (1997).

Упершыню ўпамінаецца ў 2-й пал. 14 ст. (не пазней 1387) у грамаце кн. *Андрэя Альгердавіча* Полацкага. Адносілася да Полацкай зямлі, потым да Полацкага ваяв. У розны час належала Корсакам, Глябовічам, Вепрахоўскім, Цеханавецкім і інш. З 1793 у Рас. імперыі, у Дзісенскім пав. Мінскай, з 1842 — Віленскай губ. З 1863 цэнтр воласці ў Дзісенскім пав. Пры валасным праўленні працавала сельская школа. У 1897 у З. 176 ж. З 1921 у Польшчы, з 1939 у БССР. З 1940 цэнтр сельсавета. 311 ж., 114 гаспадарак (1971).

Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — сядзіба (19 ст.). Каля вёскі — курганны могільнік.

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл., каля Дняпроўска-Бугскага канала, на аўтадарозе Кобрын — Іванава. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 8 км на У ад горада і 10 км ад чыг. ст. Кобрын, 54 км ад Брэста. 621 ж., 228 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл., на левым беразе р. Вілія, каля аўтадарогі Маладзечна—Смаргонь; чыг. ст. на лініі Мінск—Гудагай. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на ПдУ ад г. Смаргонь, 233 км ад Гродна. 1148 ж., 432 двары (1997).

Вядома з 16 ст. як фальварак Дзербы. У 1690 згадваецца ў ліку паселішчаў Смаргонскай парафіі Ашмянскага пав. У 18 — пач. 20 ст. ўласнасць роду *Агінскіх*. З 1795 у Рас. імперыі, у 19 — пач. 20 ст. ў Ашмянскім пав. Віленскай губ. У 1802—22 у З. жыў М.К.*Агінскі*, тут ім створаны шэраг муз. твораў, у т.л. паланэз «Развітанне з Радзімай». У 1880-я г. фальварак і вёска, 50 жыхароў. З 1921 у Польшчы, у Маладзечанскім пав. Віленскага ваяв. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета Смаргонскага р-на. У 1971 — 806 ж., 258 двароў.

Мэблевы цэх. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры і гісторыі *Залескі палацава-паркавы ансамбль* (1802—22).

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Чачэрскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Сож. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 7 км на ПдУ ад г. Чачэрск, 72 км ад Гомеля, 42 км ад чыг. ст. Буда-Кашалёўская. 495 ж., 219 двароў (1997). Базавая школа, б-ка, аддз. сувязі. Каля вёскі паселішчы эпохі неаліту і бронз. веку.

«ЗАЛЕ́ССЕ», шклозавод у Вілейскім р-не. Засн. ў 1769 як гута ў в. Ілья. З 1802 шклозавод у маёнтку Залессе, з 1815 у засценку Стражыслаў, з 1855 за 3 км ад в. Залессе Вілейскага пав. (цяпер пас. Партызанскі Вілейскага р-на). У 1900 працавала 157 рабочых, выраблена сталовага і аптэчнага посуду і лямпаў на 90,7 тыс. руб. У 1910 дзейнічаў паравы рухавік. Прадукцыю збывалі ў Рыгу, Вільню, Гродна і інш. У Вял. Айч. вайну разбураны, у 1944 адноўлены як шклозавод «Залессе». У 1961—73 пабудаваны новыя цэхі, у 1988—90 рэканструяваны. Да 1993 вырабляў сілікатглыбы (растваральнае шкло) і шклатару (слоікі). Цяпер выпускае піўныя, гарэлачныя, тэхнічныя бутэлькі. У 1996 выраблена 22,3 млн. шт. гарэлачных і 5,5 млн. шт. тэхн. бутэлек. З 1997 адкрытае акц. т-ва шклозавод «Залессе».

ЗАЛЁТНЕЎ Алег Барысавіч (н. 8.7.1947, г.п. Сухабязводнае Ніжагародскай вобл., Расія), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1974, клас П.*Падкавырава*). У 1979—83 заг. літ. часткі Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі. З 1984 выкладае ў Бел. акадэміі мастацтваў. Творчасці ўласцівы перавага лірычнай вобразнасці, спалучэнне класічнай традыцыі, неакласіцыстычных тэндэнцый і сучасных тэхнік кампазіцыі. Сярод твораў: балет «Кругаверць» па матывах нар. балад (паст. 1996, лібр. Ю.Чурко); драм. араторыя «Ліст кі календара» (сл. М.Танка, 1983), «Літургія св. Іаана Златавуста» (1994), «Нясвіжская меса» паводле твораў кампазітараў 18 ст. (1997); камерная сімфонія (1979), адажыо «Doloroso» (1980); канцэрты: для фп. (1974), для голасу (1988), для ўдарных інструментаў «Credo» (1992), для аргана і ўдарных (1993) з аркестрам; паэма-карціна «Купальская ноч» для нар. арк. (1982); «Тэатральны дывертысмент» для ансамбля духавых, ударных і фп. (1992); камерна-вак. і камерна-інстр. творы; хары, рамансы, песні; музыка да драм. спектакляў, кіна- і тэлефільмаў, радыёпастановак.

Р.М.Аладава.

ЗАЛІ́Ў, частка акіяна, мора ці возера, якая дастаткова глыбока ўразаецца ў сушу, але мае свабодны водаабмен з асн. вадаёмам. У залежнасці ад прычын узнікнення, памераў, канфігурацыі, звязанасці з асн. вадаёмам адрозніваюць *бухты, гафы, лагуны, фіёрды і эстуары*. Часам З. называюць асобныя ч. Сусветнага ак., якія па сваім гідралагічным рэжыме належаць да мораў (напр., Мексіканскі, Гудзонаў).

ЗАЛІ́Ў СТАРЫ́К, возера на мяжы Мазырскага і Нараўлянскага р-наў Гомельскай вобл., на пойме р. Прыпяць, за 7 км на Пд ад г. Нароўля. Пл. 0,43 км^2, даўж. 4,2 км, найб. шыр. 150 м, даўж. берагавой лініі 9,5 км. Старычнае. Берагі высокія, месцамі абразійныя, пад хмызняком. Злучана ручаём з воз. Старык. У веснавое разводдзе злучаецца з Прыпяццю.

ЗАЛІ́ЎСКІ Юзаф (1797, Віленшчына — 1.9.1855), удзельнік польскага нац.-вызв. руху 1820 — пач. 1830-х г., адзін з лідэраў польскай паліт. эміграцыі ў Францыі. З 1817 служыў у войску Каралеўства Польскага, чл. нелегальных арг-цый — Саюза вольных палякаў, Патрыятычнага т-ва і інш. Удзельнік *паўстання 1830—31*. У ноч на 30.11.1830 кіраваў захопам арсенала ў Варшаве, удзельнічаў у стварэнні паўстанцкіх атрадаў, у баях, меў чын палкоўніка. Пасля падаўлення паўстання эмігрыраваў у Францыю, дзе зблізіўся з рухам карбанарыяў. У 1832 перайшоў на тэр. Галіцыі, дзе арыштаваны і засуджаны да пакарання смерцю, якое заменена на 20-гадовае зняволенне. У 1848 амнісціраваны, выехаў у Парыж, дзе і памёр. *В.Ф.Шалькевіч.*

ЗА́ЛКІНД Леанід Самойлавіч (1861, г. Чавусы Магілёўскай вобл. — 17.9.1929), удзельнік рэв.-народніцкага руху. Вучыўся ў Магілёўскай гімназіі. У 1880 далучыўся да «Народнай волі». З 1881 студэнт Кіеўскага ун-та, адзін з арганізатараў «Камуны магілёўцаў». У 1882 у нарадавольскай групе А.Бычкова (гл. ў арт. *Бычковы*), удзельнічаў у аднаўленні разгромленай нарадавольскай арг-цыі Кіева. У 1882 і 1883 арыштаваны, у 1884 высланы на 5 гадоў ва Усх. Сібір, дзе збіраў матэрыялы пра жыццё і дзейнасць дзекабрыстаў у ссыльцы. З 1889 у Краменчугу, пасля 1917 у Маскве, заг. б-кі Політэхн. музея. Аўтар успамінаў пра народніцкі рух і яго дзеячаў.

М.Б.Ласінскі.

ЗАЛО́Г, з а к л а д, 1) у цывільным праве спосаб забеспячэння абавязацельстваў, які заключаецца ў перадачы даўжніком крэдытору грошай або інш. матэрыяльнай каштоўнасці, з вартасці якой крэдытор мае пераважнае права задаволіць сваё патрабаванне пры невыкананні даўжніком абавязацельства. 2) У крымін. працэсе шэрагу краін (у т.л. Расіі) — *мера стрымання*, што заключаецца ў грошах або каштоўнасцях, якія ўносяцца абвінавачаным (падазроным) у дэпазіт суда для забеспячэння яго яўкі да следчага, пракурора або ў суд. У выпадку ўхілення ад яўкі ўнесены З. спаганяецца ў даход дзяржавы. 3) З. в ы б а р ч ы — у некаторых краінах (Вялікабрытанія, Францыя) грашовая сума, што абавязаны ўнесці кандыдат у дэпутаты прадстаўнічага органа пры рэгістрацыі сваёй кандыдатуры.

ЗАЛО́ЖНІКІ, асобы, процірапраўна затрыманыя сілай з мэтай прымусіць дзяржаву, арганізацыю ці інш. асоб выканаць пэўныя дзеянні ці абавязкі. У міжнар. праве — грамадзяне захопленай ворагам краіны, якія неправамерна ўтрымліваюцца акупац. ўладамі пад пагрозай іх знішчэння, калі насельніцтва акупіраванай тэрыторыі не выканае патрабаванняў акупац. улад. Жэнеўская канвенцыя 1949 аб ахове грамадз. насельніцтва ў час вайны забараняе захоп З. і разглядае такія дзеянні як міжнар. злачынствы.

ЗАЛО́ЗІСТЫЯ ТКА́НКІ раслін, утварэнні, якія служаць для назапашвання і выдзялення з расліны кропельна-вадкай вады і розных рэчываў. Вылучаюць З.т.: *гідатоды, нектарнікі*, алейныя, камедзевыя, слізевыя, смаляныя і стрававальныя. Стрававальныя З.т. ў насякомаедных раслін выдзяляюць стрававальныя сокі, здольныя ператраўляць арган. рэчывы. Алейныя, смаляныя, слізевыя і камедзевыя залозкі (органы выдзялення або сховішча выдзяленняў) выдзяляюць *бальзам, камедзь*, смолы, эфірны алей, слізь і інш.

ЗАЛО́ЗНІЦА (Scrophularia), род кветкавых раслін сям. залознікавых. Каля 310 відаў. Пашыраны пераважна ў нетрапічнай ч. Паўн. паўшар'я. На Беларусі трапляюцца З. вузлаватая (S. nodosa) і ценявая (S. umbrosa). Растуць па берагах рэк, вадаёмаў, у цяністых месцах, лясах, каля дарог і на пустках.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны і паўкусты з прамастойным або ўзыходным сцяблом. Лісце супраціўнае, рэдка кальчаковае, цэласнае, перыстараздзельнае або перыстарассечанае. Кветкі дробныя, малапрыкметныя, звычайна зеленавата-бурыя ці жоўтыя, двухполыя, двухгубыя, сабраны па 2—10 у паўпарасонікі, што ўтвараюць канцавыя агульныя мяцёлчатыя або гронкападобныя суквецці. Плод — 2-гнездавая каробачка. Лек. і меданосныя расліны. Ядавітыя.

Залозніца вузлаватая.

ЗАЛО́ЗНІЦА ВУГРАВА́Я (Demodex folliculorum), клешч сям. валасяных кляшчоў. Пашыраны ўсюды. Паразітуе ў скурных залозах і валасяных мяшэчках чалавека і млекакормячых.

Цела падоўжанае (0,3—0,4 мм), чэрвепадобнае, светла-шэрае з нерасчлянёнымі галавагрудзьмі і вузкім брушкам з папярочнымі рыскамі, укрыта празрыстай кутыкулай. Ротавыя органы колючыя. 4 пары ног. Цыкл развіцця 20—25 сут са зменай 3 лічыначных стадый у целе аднаго гаспадара. Выклікае інвазійную хваробу ў чалавека і жывёл — залознічную каросту (дэмадэкоз).

Залозніца вугравая.

ЗАЛОЗНІЦАКВЕ́ТНЫЯ (Scrophulariales), парадак двухдольных кветкавых раслін. 12 сям., больш за 1 тыс. родаў і 12 тыс. відаў. Пашыраны амаль па ўсім зямным шары, асабліва ва ўмераных, субтрапічных і трапічных абласцях. На Беларусі 5 сям.: залознікавыя, заразіхавыя, паслёнавыя, плывунцовыя, трыпутнікавыя, 32 роды. Сярод іх больш за 100 дзікарослых і 30 інтрадукаваных відаў, у т.л. важныя харч. (бульба, памідоры), тэхн. (тытунь, махорка), лек. (аўран, залозніца, красаўка, трыпутнік), дэкар. (будлея, ільвіны зеў, петунія), меданосныя расліны; ёсць насякомаедныя (тлушчанка), ядавітыя і пустазелле.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны, паўкусты, радзей кусты і дрэвы. Лісце чаргаванае або супраціўнае, іншы раз кальчаковае, без прылісткаў. Кветкі двух-, радзей аднаполыя, пераважна няправільныя, 5-членныя, са зрослапялёсткавым вяночкам. Тычынак 5—4 (іншы раз 2). *Гінецэй* звычайна з 2 (радзей 5) зрослых пладалісцікаў. Завязь двух- ці аднагнездавая, з многімі семязародкамі. Плод — каробачка, іншы раз ягада. Насенне з *эндаспермам*. *Г.У.Вынаеў.*

М.Залозны. «9 Мая. Удовы». 1973.

ЗАЛО́ЗНЫ Мікалай Рыгоравіч (16.10.1925, в. Княжычы Кіеўскай вобл., Украіна — 7.4.1982), бел. жывапісец, педагог. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1959). Выкладчык Мінскага маст. вучылішча (з 1959), Бел. тэатр.-маст. ін-та (з 1971). Працаваў у галіне тэматычнай карціны, пейзажа, нацюрморта, партрэта. Творам уласціва прыўзнята-эмацыянальнае гучанне, якое ствараецца напружанымі, часта кантрастнымі колеравымі спалучэннямі. Сярод работ: «Студэнты» (1962), «Вызваленая зямля» (1965), «Макі», «Казка», «Коні» (усе 1966), «Сыны» (1967), «Перамога», «Камсамольцы» (абедзве 1968), «Салдаткі» (1969), «9 Мая. Удовы» (1973), «Возера Сялява» (1977), «Сястра» (1980), «Цюльпаны», партрэт А.М.Нячаева (абедзве 1981).

ЗАЛО́ЗЫ, органы (клеткі) жывёл і чалавека, якія выпрацоўваюць і выдзяляюць спецыфічныя фізіялагічна актыўныя рэчывы (гармоны, слізь, сліна, мускус і інш.) і ўдзельнічаюць у розных фізіял. функцыях і біяхім. працэсах у арганізме. Большасць З. утвораны эпітэліяльнай тканкай і добра рэгенерыруюць. Адрозніваюць *залозы ўнутранай сакрэцыі* (эндакрынныя) і З. знешняй сакрэцыі (экзакрынныя), якія праз вывадныя пратокі выдзяляюць сакрэты на паверхню цела, слізістых абалонак або ў знешняе асяроддзе (потавыя, слінныя, малочныя, васковыя З. насякомых і інш.). Паводле тыпу сакрэцыі адрозніваюць З. меракрынныя (без страты цытаплазмы), апакрынныя (з адрывам верхавінкі клеткі з сакраторным уключэннем) і галакрынныя (з парушэннем сакраторнай клеткі). Бываюць аднаклетачныя (напр., бакалападобныя клеткі эпітэлію слізістай абалонкі кішэчніка і дыхальных шляхоў) і шматклетачныя (напр., большасць З. эндакрыннай сістэмы). Адрозніваюць простыя З. (іх вывадная пратока звязана з адным канцавым сакраторным аддзелам) і складаныя (у іх агульны ход выводзіцца сакрэт некалькіх або многіх канцавых сакраторных аддзелаў). Удзельнічаюць у працэсах абмену рэчываў і энергіі, рэгуляцыі жыццядзейнасці арганізма, ахоўваюць цела ад уздзеяння шкодных фактараў знешняга асяроддзя. *А.С.Леанцюк.*

ЗАЛО́ЗЫ ЎНУ́ТРАНАЙ САКРЭ́ЦЫІ, інкрэторныя залозы, эндакрынныя залозы, органы жывёл і чалавека, якія выпрацоўваюць і выдзяляюць фізіялагічна актыўныя рэчывы (*гармоны*) непасрэдна ў кроў або лімфу. У іх адсутнічаюць вывадныя пратокі. Да З.у.с. належаць *гіпаталамус, гіпофіз, эпіфіз, наднырачныя залозы, парашчытападобныя залозы, палавыя залозы* (іх унутрысакраторныя элементы), *шчытападобная залоза*, астраўкі *падстраўнікавай залозы*. Эндакрынныя функцыі ўласцівы *вілачкавай залозе, плацэнце*, эндакрынным клеткам стрававальнага тракту (*слінныя залозы, страўнік, кішэчнік*), дыхальных шляхоў, нырак, сэрца, печані і інш. З.ў.с. шчодра забяспечваюцца крывёй, таму гармоны хутка паступаюць у кроў, з якой трапляюць да органаў, тканак і аказваюць спецыфічнае рэгулюючае дзеянне на метабалізм. З.ў.с. знаходзяцца паміж сабой у функцыян. залежнасці і складаюць цэласную эндакрынную сістэму, якая ажыццяўляе гарманальную рэгуляцыю ўсіх асн. працэсаў жыццядзейнасці. Разам з нерв. сістэмай З.ў.с. рэгулююць усе функцыі арганізма. Іх рэгулюючы цэнтр — гіпаталамус. Парушэнне функцый З.у.с. вядзе да цяжкіх эндакрынных захворванняў. *А.С.Леанцюк.*

ЗАЛО́М, завал, які ўзнікае звычайна ў мелкіх або вузкіх месцах рэчышчаў у выніку нагрувашчвання вымытых і перанесеных ракой дрэў, галін і інш. На Беларусі зрэдку назіраюцца на невял. лясных рэчках і ручаях.

ЗАЛО́М у д р а ў л я н ы м д о й л і д с т в е, зрубная канструкцыя шмат'яруснага верху ў выглядзе ўсечанай піраміды ці прызмы. Вядомы на Украіне з 16 ст. У бел. культавай архітэктуры 17—19 ст. сустракаліся вярхі з адным ці з двума З., якія стваралі ступеньчата-ярусную кампазіцыю будынка, надавалі яму выразны сілуэт. Часам спалучаліся з ветразямі (пры чаргаванні чацверыкоў і васьмерыкоў). З. выкарыстоўваліся ў цэрквах (вёскі Рубель Столінскага, Міхалкі Мазырскага р-наў) і званіцах (Клецк).

Да арт. **Залом**. Міхайлаўская царква. 1796. Вёска Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобл.

ЗАЛП, адначасовы выстрал (пуск) з некалькіх гармат, мінамётаў, ракетных і рэактыўных пускавых установак, тарпедных апаратаў, стралковай і інш. зброі. Даецца па пэўным сігнале (камандзе) для нанясення агнявога ўдару, а таксама пры святочных салютах і адданні ваенных ушанаванняў («халастыя» З. — без снарадаў і куль).

ЗА́ЛПАВЫ ВЫ́КІД, адначасовы канцэнтраваны выкід значнай колькасці забруджвальных рэчываў у навакольнае асяроддзе; *аварыйны выкід*. Выкарыстоўваўся прадпрыемствамі з устарэлымі сістэмамі ачышчальных збудаванняў наўмысна, напр., на буйных вадатоках у час паводкі (з мэтай хуткага разбаўлення сцёкаў). Прычыняе ўрон прыродзе, рэзка парушае колькасныя і якасныя суадносіны асн. матэрыяльна-энергетычных кампанентаў асяроддзя (вод, глеб, энергіі, расліннага покрыва, жывёльнага свету і інш.).

ЗАЛУ́ЖЖА, вёска ў Дражнаўскім с/с Старадарожскага р-на Мінскай вобл., на аўтадарозе Старыя Дарогі—Дрычын. Цэнтр калгаса. За 18 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Старыя Дарогі, 130 км ад Мінска. 664 ж., 339 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан; сав. лётчыкаў. Помнік архітэктуры — царква (мяжа 19—20 ст.). Каля вёскі помнік партызанам.

ЗАЛУ́ЖЖА, вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Стоўбцы—г.п. Мір. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 11 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Стоўбцы, 89 км ад Мінска. 429 ж., 158 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ЗАЛУЖЭ́ННЕ, зарастанне зямельных участкаў травяністай расліннасцю. Адрозніваюць прыроднае (самазарастанне травяністай расліннасцю высечак, закінутай раллі і інш.) і штучнае З. (засяванне поля шматгадовымі злакавымі і бабовымі травамі ці травасумесямі для стварэння культ. пашы ці сенажаці для паляпшэння прыродных кармавых угоддзяў). На забалочаных мінер. і тарфяных глебах З. праводзяць пасля выканання меліярац. і культуртэхн. работ. Праводзяць З. таксама пры азеляненні населеных пунктаў, буд-ве стадыёнаў, аэрадромаў, замацаванні адхонаў дарог, дамбаў, для барацьбы супраць эрозіі глебы.

ЗАЛУ́ЦКІ Пётр Антонавіч (люты 1887, в. Круча Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. — 10.1.1937), рэвалюцыянер, дзеяч РКП(б). З 1905 вёў рэв. работу ў Пецярбургу, Сібіры, на Д.Усходзе. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. З 1907 чл. РСДРП. Адзін з арганізатараў выдання бальшавіцкіх газ. «Звезда», «Правда». Дэлегат VI (Пражскай) Усерас. канферэнцыі РСДРП (1912). За рэв. дзейнасць некалькі разоў быў арыштаваны і сасланы. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 чл. выканкома Петраградскага Савета, дэлегат VII (Красавіцкай) Усерас. канферэнцыі і VI з'езда РСДРП(б). У час Кастр. ўзбр. паўстання чл. Петраградскага ВРК. У грамадз. вайну чл. Ваен. савета Усх. і Зах. франтоў. У 1920—22 канд. у чл. ЦК, у 1923—25 чл. ЦК РКП(б). Абвінавачаны ва ўдзеле ў «трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі», у 1927 выключаны з РКП(б) (у 1928 адноўлены). У 1928—32 на гасп. рабоце. У 1934 арыштаваны, у 1935 асуджаны на 5 гадоў зняволення, у 1937 — да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1962.

ЗАЛЫ́ГІН Сяргей Паўлавіч (н. 6.12.1913, в. Дурасаўка, Башкортастан), рускі пісьменнік. Акад. Рас. АН (1991). Герой Сац. Працы (1988). Скончыў Омскі с.-г. ін-т (1939). Працаваў інжынерам-гідратэхнікам, у Сібірскім аддзяленні АН СССР. З 1986 гал. рэдактар час. «Новый мир». Першыя зб-кі «Апавяданні» (1941), «На Вялікую зямлю» (1952), «Нарысы і апавяданні» (1953). У раманах «Сцежкі Алтая» (1962), «Салёная Падзь» (ч. 1—2, 1967—68, Дзярж. прэмія СССР 1968), «Паўднёваамерыканскі варыянт» (1973), «Камісія» (1975), «Пасля буры» (кн. 1—2, 1980—85), «Свабода выбару: раман без сюжэта» (1996) звяртаецца да найважнейшых пераломных этапаў паслярэв. гісторыі Расіі і сучаснага жыцця Зах. Сібіры. Як публіцыст актыўна адстойвае сваю пазіцыю (у 1980-я г. выступаў супраць павароту паўн. рэк), імкнецца асэнсаваць складаныя працэсы сучаснага жыцця («Мая дэмакратыя. Нататкі па ходу жыцця. З успамінаў пісьменніка», 1996). Аўтар літ.-знаўчых прац пра А.Чэхава, Л.Талстога, А.Платонава. Творы З. на бел. мову пераклалі А.Кудравец, В.Адамчык.

С.П.Залыгін.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—6. М., 1989—91; Бел. пер. — На Іртышы: Аповесць, апавяданні. Мн., 1991.

Літ.: Д е д к о в И.А. Сергей Залыгин: Страницы жизни, страницы творчества. М., 1985.

С.Ф.Кузьміна.

ЗАЛЬВЯ́НКА, рака ў Брэсцкай і Гродзенскай абл., левы прыток р. Нёман. Даўж. 170 км. Пл. вадазбору 1940 км^2. Пачынаецца паміж вёскамі Лідзяны і Кулявічы Свіслацкага р-на, цячэ ў Ваўкавыскім, Пружанскім, Зэльвенскім і Мастоўскім р-нах. Асн. прытокі: Шчы-

Рака **Зальвянка** ў ніжнім цячэнні.

ба, Ружанка, Іванаўка, Сасва, Самараўка, Юхнаўка.

Даліна трапецападобная, яе шыр. ад 500 м да 3—4 км у ніжнім цячэнні. Пойма забалочаная, роўная, шыр. да 2,5 км, у сярэднім і ніжнім цячэнні 400—600 м. Рэчышча моцназвілістае, яго шыр. ў межань 15—20 м. На працягу 44,2 км каналізаванае: ад вытоку да в. Краскі Ваўкавыскага р-на (16 км) і на ўчастку за 2 км на Пн ад г.п. Зэльва — 2 км на Пн ад в. Ліхінічы Мастоўскага р-на (28,2 км). Берагі пясчаныя, стромкія і абрывістыя. Замярзае ў канцы снеж., крыгалом у сярэдзіне сакавіка. Жыўленне мяшанае. Сярэднегадавы расход вады ў вусці каля 11 м^3/с. На рацэ вадасховішчы Зэльвенскае і Паперня, г.п. Зэльва, г. Масты (пры ўпадзенні Зальвянкі ў Нёман).

ЗА́ЛЬКАЛНС (Zalkalns) Тэадор Эдуардавіч (30.11.1876, хутар Заляйскалнс Рыжскага р-на, Латвія — 6.9.1972), латышскі скульптар. Нар. мастак СССР (1957), сапраўдны чл. АМ СССР (1947). Вучыўся ў Пецярбургу (1893—99), уваходзіў у гурток «Рукіс» («Працаўнік»); у 1899—1901 у Парыжы ў майстэрні А.Радэна, вучань Э.А.*Бурдэля* і інш. У 1903—07 выкладаў у маст.-прамысл. школе ў Екацярынбургу, настаўнік І.Дз.*Шадра*. З 1910 у Пецярбургу. У 1918—19 удзельнічаў у плане манум. прапаганды (помнікі М.Г.Чарнышэўскаму, Л.А.Бланкі ў Петраградзе, не захаваліся). З 1920 у Рызе; у 1944—58 праф. АМ Латвіі. Сярод твораў: партрэты (А.Кірхенштэйна, 1946; Ф.Блумбаха, 1956; К.Барона, 1967, і інш.), 20 надмагілляў (Я.Порука, 1930; О.Лацыса, 1945, і інш.), помнікі Р.Блаўманісу ў Рызе (1929) і А.Кронвалдсу ў Сігулдзе (1938), творы анімалістычнага жанру, медалі.

Т.**Залькалнс**. Партрэт К.Барона. 1967.

ЗА́ЛЬНЫ ХРАМ, выцягнуты ў плане храм з нефамі аднолькавай вышыні ці вышэйшым (без акон) сярэднім нефам (псеўдабазіліка), а таксама 1-нефавы храм без трансепта (прапаведніцкая царква, царква жабрацкіх ордэнаў). Характэрна раўнамернае асвятленне інтэр'ера, якое скрадвае яго чляненне. З.х. з двума і больш нефамі вядомы з 11 ст. (царква Сен-Сернен у Тулузе, Францыя, канец 11 ст.). У 12 ст. пашыраны ў Вестфаліі і сталі тыповымі як прыходскія цэрквы 13—15 ст. у гарадах Ганзейскага саюза (касцёл Дзевы Марыі ў Гданьску, Польшча, 1343—1502). Гатычныя З.х. будавалі ў Італіі, Іспаніі і інш. краінах Зах. Еўропы. Як саборы трапляюцца рэдка. З эпохі Адраджэння З.х. амаль не будуюць.

ЗА́ЛЬЦБУРГ (Salzburg), горад у зах. ч. Аўстрыі, у перадгор'ях Альпаў, у даліне р. Зальцах. Адм. ц. зямлі Зальцбург. 144 тыс. ж. (1991). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., паліграф., дрэваапр., швейная, харчовая. Ун-т (з 1622). Муз. акадэмія Моцартэум (з 1841). Штогадовы муз.-тэатр. фестываль (з 1917). Цэнтр турызму і курорт міжнар. значэння.

Да арт. **Зальны храм**. Касцёл Дзевы Марыі ў Гданьску. 1343—1502.

У 1—5 ст. н.э. на месцы З. існавала стараж.-рым. калонія Ювавум. З 739 рэзідэнцыя епіскапа (засн. каля 700), з 798 — архіепіскапа, а таксама купецкае паселішча (назва З. упершыню згадваецца ў 774). Гар. правы з 1368. Месца значных выступленняў у Сял. вайну 1524—26 (гл. ў арт. М.*Гайсмайр*). У 1622 засн. ун-т. У 1810—15 належаў Баварыі. У 1938—45 акупіраваны ням.-фаш. войскамі. У 1945—55 у складзе амер. зоны акупацыі Аўстрыі.

Сярод арх. помнікаў абацтва бенедыкцінцаў (засн. каля 690): касцёл св. Пятра (12—13 ст.); комплекс раманскіх і гатычных кляштарных будынкаў (12—14 ст., у т.л. б-ка з багатымі зборамі, скарбніца, капітуляр); могільнік з катакомбамі (3 ст.) і комплексам капліц, у т.л. познагатычная капліца св. Маргарыты (1485—91); сабор (асвячоны ў 774, перабудаваны ў 1611—28 у стылі барока, арх. С.Салары), абкружаны ансамблем з трох плошчаў з рэзідэнцыяй архіепіскапа (засн. каля 1120, перабудоўвалася ў 16—18 ст.); абацтва бенедыкцінак Нонберг: рамана-гатычны касцёл (11—12, 15 ст.) з раманскімі насценнымі размалёўкамі (сярэдзіна 12 ст.), кляштар (13—17 ст.); касцёл францысканцаў: раннегатычны неф (пач. 13 ст.), гатычны прэсбітэрый (пач. 14 ст.) са скульптурай Мадонны, познагатычная вежа (1486—94); барочныя цэрквы І.Б.Фішэра фон Эрлаха — Калегіяльная (1694—1707), Тройцы (1694—1702), Урсулінак (1699—1705), Шпітальная св. Іаана (1699—1704); б. стайні (1607—62) з зімовай (1662) і летняй (1693) школамі верхавой язды (у 1920—30-я г. перабудаваны ў «Дом прыроды») і будынак моцартаўскіх фестываляў «Фестшпільгаўз», арх. К.Гольцмайстэр, Э.Гютэр). Над старым горадам (на выш. 130 м) крэпасць Гоэнзальцбург (засн. ў 1077, перабудавана ў 1465—1519). Муз. акадэмія «Моцартэум» (1912—14, арх. Р.Бернт). Радзіма



Панарама **Зальцбурга**.

В.А.Моцарта і яго дом-музей. Музей Караліны Аўгусты. Каля З. замак Гельбрун (1613—19, арх. Салары). *У.Я.Калаткоў* (гісторыя).

ЗА́ЛЬЦГІТЭР (Salzgitter), горад на Пн Германіі, у зямлі Ніжняя Саксонія. Узнік у 1936 пры зліцці некалькіх населеных пунктаў і буд-ве металургічнага камбіната. 117,7 тыс. ж. (1994). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на адгалінаванні Сярэднегерманскага канала. Аэрапорт. Прам-сць: чорная металургія, вытв-сць абсталявання для горнай і нафтаздабыўной прам-сці, вагона- і аўтамабілебудаванне, нафтахім., тэкстыльная. Курорт (мінер. воды).

Э.Заля.

ЗАЛЯ́ (Zola) Эміль (2.4.1840, Парыж — 29.9.1902), французскі пісьменнік. Ранія творы (зб. навел «Казкі Нінон», 1864; раманы «Споведзь Клода», 1865, «Марсельскія таямніцы», 1867) напісаны пад уплывам рамантызму. Кнігамі літ. і маст. крытыкі «Што я ненавіджу» і «Мой салон» (абедзве 1866), «Эдуар Манэ» (1867) выступіў у абарону новай плыні мастацтва, у прыватнасці імпрэсіянізму. Прыродазнаўчыя адкрыцці (тэорыя эвалюцыі Ч.Дарвіна), філасофія і эстэтыка пазітывізму (І.Тэн) падвялі З. да распрацоўкі канцэпцыі *натуралізму*, асн. палажэнні якога ён выклаў у прадмове да рамана «Тэрэза Ракэн» (1867), у працах «Эксперыментальны раман» (1880) і «Раманісты-натуралісты» (1881). У 1860-я г. З. распачаў серыю з 20 раманаў «Ругон-Макары. Звычайная і сац. гісторыя адной сям'і ў эпоху Другой імперыі» (1868—93), у якой даў маштабную панараму франц. грамадства 2-й пал. 19 ст. Тут па-майстэрску выпісаны вобразы прадстаўнікоў розных класаў, саслоўяў, прафесій і іх асяроддзе: гандлёвая і фінансавая буржуазія («Чэрава Парыжа», 1873, «Дамскае шчасце», 1883, «Грошы», 1891), рамеснікаў і шахцёраў («Пастка», 1877, «Жэрміналь», 1885), сялян («Зямля», 1887), царкоўнікаў і палітыкаў («Праступак абата Мурэ», 1875, «Яго правасхадзіцельства Эжэн Ругон», 1876), мастакоў і ваенных («Творчасць», 1886, «Разгром», 1892) і інш. Роздумы пісьменніка над сац. канфліктамі эпохі, шляхамі перабудовы грамадства, захапленне ідэямі утапічнага сацыялізму знайшлі адлюстраванне ў цыкле «Тры гарады» («Лурд», 1894, «Рым», 1896, «Парыж», 1898) і тэтралогіі «Чатыры Евангеллі» (1898—1902, незавершана). За пісьмо «Я абвінавачваю» ў абарону А.Дрэйфуса (гл. *Дрэйфуса справа*) прыгавораны да турэмнага зняволення, з-за чаго вымушаны быў эмігрыраваць у 1898 (вярнуўся праз год). Творчасць З., які з'яднаў «бязлітаснасць рэалізму з мужнасцю палітычнага дзеяння» (Л.Арагон), зрабіла значны ўплыў на еўрап. і амер. раманістыку 20 ст. У бел. пер. выйшлі «Апавяданні» (1937), раманы З. «Пастка» (1939) і «Разгром» (1941).

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—26. М., 1960—67.

Літ.: Владимирова М.М. Романный цикл Э.Золя «Ругон—Маккары»: Худ. и идейно-филос. единство. Саратов, 1984.

Т.У.Кавалёва.

ЗАЛЯГА́ННЕ ГО́РНЫХ ПАРО́Д, прасторавае размяшчэнне, форма і ўзаемаадносіны геалагічных цел у зямной кары. Вызначаецца элементамі залягання (распасціранне, напрамак і вугал нахілу слаёў або пластоў), якія вымяраюцца горным компасам. Для асадкавых парод характэрна пластападобная форма, першапачаткова блізкая да гарыз. залягання. Вулканічныя пароды залягаюць у выглядзе пластоў патокавай і покрыўнай формы. Магматычныя інтрузіўныя пароды ўтвараюць геал. целы (баталіты, штокі, дайкі, лакаліты, сілы і інш.). Метамарфічныя пароды залягаюць масівамі на вял. плошчы, ахопленай працэсамі метамарфізму. Адрозніваюць непарушанае (нармальнае) і парушанае З.г.п., а таксама згоднае (калі слаі фарміраваліся ў нармальнай узроставай паслядоўнасці) і нязгоднае (стратыграфічны перарыў або размыў горных парод; вуглавая нязгоднасць — калі маладыя асадкі залягаюць над пародамі, змятымі ў складкі, ці манаклінальна нахіленымі).

У.І.Шкуратаў.

ЗАЛЯШНО́, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Обаль, за 38 км на ПнУ ад г. Гарадок. Пл. 0,36 км², даўж. 820 м, найб. шыр. 600 м, даўж. берагавой лініі каля 3 км. Пл. вадазбору 4 км². Схілы катлавіны выш. 10—12 м, пераважна пад хмызняком, на З і Пн часткова разараныя. На З выцякае р. Агнеш.

ЗАМА́Й Ала Мікалаеўна (н. 14.9.1932, с. Займо-Абрыў Растоўскай вобл., Расія), бел. мастачка. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1959). Выкладала ў Мінскай дзіцячай маст. школе (1959—63), працавала ў газ. «Піянер Беларусі» (1963—80). Творчасці ўласцівы арыгінальнасць колеравага бачання і жанравая разнастайнасць, работы адметныя аптымістычнасцю і цеплынёй. Сярод твораў: тэматычныя карціны «Будаўнікі» (1957), «Апошні з нашага квартала» (1961), «Купалле» (1976), «Крыніца жыцця» (1982), «Сонейка» (1988), «Звон святыні» і «Цішыня» (абодва 1994), «Маё дзяцінства» (1995); пейзажы «Макі» (1966), «Восень» (1990), «Бярозавы гай» (1991), «Ваколіца Забалоцця» (1995), «Раніца» (1996); нацюрморты

А.**Замай**. Сонейка. 1988.

Да арт. **Замак**. Рэканструкцыя Тураўскага замка і гарадзішча (пасля 13 ст.). Мастак Р.Данчанка.

«Антоны» (1984), «Водар лесу» (1986), «Васількі» і «Армянскі вінаград» (абодва 1992), «Палявыя кветкі» (1995); партрэты, ілюстрацыі да кніг. Іл. гл. таксама ў арт. *Нацюрморт*. *Г.А.Фатыхава.*

ЗА́МАК, умацаванае жыллё феадала, а таксама сярэдневяковы комплекс *абарончых збудаванняў*, жылых гасп. і культавых пабудоў на зручных для абароны месцах, аб'яднаных лініяй умацаванняў. Існавалі прыватныя З. (феад., царк.) і агульнадзярж. (каралеўскія, велікакняжацкія).

Структура абароны З. складалася з драўляных (*астрогі*, вастраколы, *гародні*, парканы, *тарасы*), мураваных (каменных, цагляных) ці глінабітных сцен з баявымі памостамі-галерэямі і звязаных з імі драўляных ці камбінаваных (фахверкавых) шмат'ярусных вежаў з разнастайнымі байніцамі. Часта ў З. была гал. вежа — *данжон*. Ранніе З. (5—8 ст. ў Сярэдняй Азіі, Закаўказзі, на Арабскім Усходзе, 9—11 ст. ў Зах. Еўропе) мелі глухія мураваныя сцены і былі размешчаны на пасіўную абарону. Прамавугольныя планы гэтых З., іх буд. і канструкцыйныя асаблівасці спалучалі мясц., эліністычныя і стараж.-рым. традыцыі абарончага дойлідства. Тактыка актыўнай абароны паступова прывяла ў 11—12 ст. да ўсталявання нерэгулярнай планіроўкі, дапасаванай да рэльефу мясцовасці (З. крыжакоў у Сірыі і Палесціне). На сценах і вежах пачалі рабіць *машыкулі* і байніцы для кідання камянёў і абстрэлу ніжняй ч. сцен. Перад уваходнымі брамамі часам узводзілі *барбаканы*. Архітэктуру З. вызначалі раманскі, гатычны, рэнесансавы і барочны стылі. Паступова З. ператварыліся ў складаныя комплексы абарончых збудаванняў (З. 13 ст. Кусі ў Францыі, Харлек у Англіі). З развіццём артылерыі З. страцілі свае абарончыя функцыі.

На Беларусі першыя З. былі агульнагар. велікакняжацкімі цытадэлямі (*Гродзенскі стары замак*), некат. мелі значныя памеры (у Полацку, Віцебску). Да 15 ст. вядомы 2 тыпы З.: на ўзвышшах («горныя»), разнастайныя па абрысах (іх план паўтараў канфігурацыю рэльефу) і ў нізінах («дольныя»), звычайна з рэгулярнай планіроўкай з выкарыстаннем валоў і равоў з вадой (Ляхавіцкі З.). Былі пашыраны З., абнесеныя драўлянымі (Радашковічы, Пінск, Гомель, Магілёў) ці муравanымі (*Лідскі замак, Крэўскі замак, Навагрудскія замкі*, Мірскі замак, *Быхаўскі замак* і інш.) сценамі. У буд-ве быў пашыраны спосаб трохслаёвай муроўкі: 2 цагляныя сцяны і забутоўка паміж імі. Часта вонкавыя паверхні сцен выкладаліся з каменю (Ліда, Крэва і інш.). Замкавае буд-ва звязана з рус. і зах.-еўрап. абарончым дойлідствам. Сустракаюцца элементы раманскай архітэктуры (вежы Навагрудскага, Гродзенскага, Лідскага і інш. З.), у большасці З. 15—16 ст. — рысы стыляў готыкі і рэнесансу (Мірскі З.), з 17 ст. пераважаюць барочныя рысы. У сярэдзіне 16 ст. сталі пашыранымі З. з бастыённай сістэмай умацаванняў (*Заслаўскі замак, Ляхавіцкі замак*). З канца 16 ст. замкавае буд-ва паступова трансфармавалася ў палацава-замкавае (*Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, Гальшанскі палац*). У 1-й пал. 19 ст. сярэдневяковыя З. замянілі крэпасці са шматкіламетровымі лініямі абароны. Замкавае буд-ва ўплывала на архітэктуру ўмацаваных храмаў (*Сынковіцкая царква-крэпасць, Камайскі касцёл, Быхаўская сінагога*), жылых дамоў (*Гайцюнішскі дом-крэпасць*), гар. брам, сядзібных і інш. пабудоў.

Да арт. **Замак**. Мірскі замак.

Да арт. **Замак**. Замак у Мальбарку. Полыпча. 1274.

Літ.: Чантурыя В.А. История архитектуры Белоруссии. 2 изд. Мн., 1977; Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII—XVII ст.). Мн., 1977; Яго ж. Замкі і людзі. Мн., 1991; Раппопорт П.А. Военное зодчество западно-русских земель X—XIV вв. Л., 1967.

М.А.Ткачоў, У.А.Чантурыя.

ЗАМА́Н, пінакалінавы эфір метылфторфасфонавай кіслаты, *атрутнае рэчыва* нервова-паралітычнага дзеяння. Сінтэзаваны ў Германіі (1944). Прыкладна ў 3 разы больш таксічны і стойкі, чым *зарын*. Выклікае міёз (звужэнне зрэнак вачэй). Лятальная таксічная доза (умоўна) пры дзеянні праз органы дыхання — 0,05 мг·мін/л, праз скуру — 1,4 мг/кг.

З. — бясколерная вадкасць з пахам камфары, $t_{кіп}$ 190 °С (кіпіць з раскладаннем), шчыльн. 1013,1 кг/м³ (20 °С). Дрэнна растваральная ў вадзе, добра — у спіртах, складаных эфірах, кетонах і інш. Гідралізуецца водным растворамі шчолачаў, аміяку, амінаў (рэакцыі выкарыстоўваюць для дэгазацыі З.).

ЗАМАНІ́ХА, эхінапанакс (*Oplopanax*), род кветкавых раслін сям. аралievых. 2 віды: З. высокая (*O. elatus*), пашырана ва Усх. Азіі, і З. страшная (*O. horridus*) — на З. Паўн. Амерыкі. Растуць звычайна ў вільготных горных хваёвых лясах, зрэдку ўтвараюць зараснікі. Занесена ў Чырвоную кнігу СССР (1984).

Лістападныя слабагалінастыя кусты выш. да 4 м. Ствол, галінкі, кветаносы і лісце ўкрыты ігольчастымі калючкамі. Лісце шыр. 15—35 см, простае, 5—11-лопасцевае, сабранае каля верхавінак сцёблаў. Кветкі дробныя, зеленавата-белыя ці зеленавата-жоўтыя, двухполыя і тычынкавыя, у парасоніках, сабраных у мяцёлчатыя суквецці. Плод — ярка-чырвоная мясістая ягадападобная касцянка. Маюць эфірныя алеі, сапаніны, алкалоіды, гліказіды. Лек. і дэкар. расліны. Вырошчваюцца ў культуры.

Г.У.Вынаеў.

Заманіха высокая.

ЗА́МАРАЗКІ, часовае паніжэнне т-ры паветра ніжэй за 0 °С у начны час, калі сярэднясутачная т-ра вышэй за 0 °С. Адрозніваюць З. адвектыўныя (пры ўварванні халоднага арктычнага паветра), радыяцыйныя (начное ахаладжэнне глебы і расліннага покрыва) і мяшаныя (адвектыўна-радыяцыйныя). На тэр. Беларусі познія З. магчымы ў канцы мая — 1-й пал. чэрвеня, а раннія ў канцы жн. — пач. верасня. З.,

асабліва позняй вясной, прычыняюць вял. шкоду сельскай гаспадарцы.

ЗАМАРО́ЖВАННЕ ГРУНТО́Ў, штучнае ахаладжэнне слабых і воданасычаных *грунтоў* да адмоўных т-р з мэтай іх умацавання і дасягнення воданепранікальнасці; адзін з відаў *замацавання грунтоў*. Выкарыстоўваецца пры буд-ве шахтаў, тунэляў, станцый метрапалітэна, падземных сховішчаў, фундаментаў, мастоў, перамычак і інш.

Для З.г. па перыметры аб'екта (напр., выемкі) прабіваюць свідравіны на адлегласці 1—3 м адна ад адной, апускаюць у іх замарожвальныя трубы (калонкі) з герметычна завараным ніжнім канцом. Унутр калонкі па трубе падаюць ахалоджаны да -20 °С і ніжэй у халадзільных машынах (установуках, на станцыях) раствор солей, або расол (звычайна хлорыстага кальцыю), па другой трубе адводзяць яго з мэтай цыркуляцыі. У выніку ахаладжэння вакол калонак утвараюцца слупы мёрзлага грунту, якія злучаюцца ў суцэльную сцяну. *М.М.Кунцэвіч.*

ЗАМАРО́ЖВАННЕ ХАРЧО́ВЫХ ПРАДУ́КТАЎ, спосаб кансервавання, які заключаецца ў хуткім ахаладжэнні прадукту да т-ры значна ніжэйшай за т-ру замярзання яго сокаў. Робяць пры т-ры каля -20 °С у маразільных камерах *халадзільнікаў* ці ў спец. хуткамаразільных апаратах.

Пры замарожванні вада ўтварае шмат дробных крышталікаў лёду, якія мала мяняюць структуру тканак прадуктаў, практычна поўнасцю спыняецца жыццядзейнасць мікрафлоры і актыўнасць ферментаў, таму прадукты доўгі час (пры ўмове, што т-ра ўвесь час застаецца аднолькава нізкай) захоўваюць свае харч. якасці.

ЗАМАСТО́ЧЧА, вёска ў Віцебскім р-не, каля р. Лучоса; чыг. станцыя на лініі Віцебск—Орша. Цэнтр сельсавета. За 20 км на Пд ад г. Віцебск. 460 ж., 203 двары (1997). Сярэдняя школа, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Вайсковыя могілкі.

ЗАМАСТО́ЧЧА, вёска ў Бягомльскім пасялковым Савеце Докшыцкага р-на Віцебскай вобл., на шашы Лепель—Мінск. Цэнтр калгаса. За 40 км на ПдУ ад Докшыц, 177 км ад Віцебска, 51 км ад чыг. ст. Параф'янава. 352 ж., 114 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

ЗАМАСТО́ЧЧА, вёска ў Лугава-Слабадскім с/с Мінскага р-на. Цэнтр саўгаса. За 20 км на ПдУ ад г. Мінск. 1953 ж., 634 двары (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ЗА́МАСЦЬ (Zamość), горад на ПдУ Польшчы. Адм. ц. Замойскага ваяв. 66 тыс. ж. (1994). Прам-сць: харч., мэблевая, трансп. машынабудаванне, швейная, буд. матэрыялаў, паліграфічная. Турыстычны цэнтр.

Засн. ў 1580 *Я.Замойскім* як горад-крэпасць, рэзідэнцыя і гасп. цэнтр Замойскай ардынацыі (створана ў 1589). Размяшчэнне на гандл. шляху з Валыні ў Люблін і Варшаву і прывілеі (на правядзенне кірмашоў, бяспошлінны гандаль у краіне і інш.) спрыялі развіццю рамёстваў (кушнерства, гарбарства і інш.). У 1585 тут створана першая ў Польшчы мануфактура па вытв-сці саф'яну, тур. дываноў і апрацоўцы казліных шкур. Заснаванне ў 1595 Замойскай акадэміі і друкарні пераварыла З. у навук. і культ. цэнтр. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Аўстрыі, з 1809 у Варшаўскім герцагстве. У час напалеонаўскай кампаніі заняты рус. войскамі (1813). З 1815 у Каралеўстве Польскім. З канца 19 ст. павятовы горад (да 1975).

Горад спраектаваў і пачаў будаваць арх. Б.Маранда ў 1579—1600; прыклад рэнесансавага горадабудаўніцтва. Быў пяцівугольны ў плане, абнесены кальцом бастыённых фартыфікацый (1587—1605; завершаны ў 1617—19, арх. А. дэль Аква; дабудаваны ў 1809—30) з брамамі, у т.л. Любельскай (1588) і Старой Львоўскай (1599). Уключае: палац (1581—86, арх. Маранда; дабудаваны ў 1747—51, арх. Бэм'дэ Кавэ, і пасля 1831), ратушу (1591—1600, арх. Маранда; 1639—51, арх. Я.Ярашэвіч, Я.Вольф, перабудавана ў 18 і 19 ст., рэстаўрыравана ў 1937—38 і 1967—70), будынкі Акадэміі (1638—48, арх. Ярашэвіч; перабудаваны ў 1752—61, арх. Бэм'дэ Кавэ, і ў 19 ст.), калегіяту (1587—98), капліцы Замойскіх (1635, арх. Дж.Б.Фальконі; цяпер кафедральны сабор), царкву (1618—31), сінагогу (каля 1610—20), камяніцы з аркадамі, у т.л. каля Вялікага і Сольнага рынкаў (16—17 ст.). З. уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. *Н.К.Мазоўка* (гісторыя).

ЗАМА́Х, наўмыснае дзеянне, непасрэдна накіраванае на ўчыненне злачынства, але не даведзенае да канца па прычынах, якія не залежаць ад волі вінаватага; адна са стадый учынення злачынства. У залежнасці ад таго, ці зрабіў вінаваты ўсё, што ён лічыў неабходным для ажыццяўлення свайго намеру, адрозніваюць закончаны і незакончаны З., у залежнасці ад выбраных сродкаў — прыгодны і непрыгодны З. Пакаранне за З. назначаецца паводле закону, які прадугледжвае адказнасць за адпаведнае злачынства, з улікам ступені ажыццяўлення злачыннага намеру і прычын, з-за якіх злачынства не было даведзена да канца.

ЗА́МАХ Леанід Пятровіч (22.7.1911, Мінск — 30.10.1982), бел. графік. Вучыўся ў маст. студыях у М.Керзіна і В.Волкава (1929—30), скончыў БПІ (1937). Стварыў ілюстрацыі да кніг «Казкі лірніка» М.Танка (1948), «Мая рэспубліка» К.Кірэенкі (1949), «У Маскву» І.Шамякіна (1950), «Апавяданні. Казкі» З.Бядулі (1958) і інш. Выканаў шэраг партрэтаў для Бел. дзярж. музея гісторыі Вял. Айч. вайны (1944—45). Аўтар агітплакатаў «Даражы гонарам хлебароба!» (1963), «З днём нараджэння, Радзіма» (1967) і інш.

ЗАМАЦАВА́ННЕ ГРУНТО́Ў, штучнае павышэнне мех. трываласці, звязнасці, воданепранікальнасці і інш. фіз.-мех. уласцівасцей *грунтоў* у іх прыродным або штучным заляганні. Робіцца для павышэння нясучай здольнасці асноў збудаванняў, умацавання сценак катлаванаў, горных вырабатак, стварэння проціфільтрацыйных заслон у плацінах, дамбах, перамычках, пры буд-ве шахтаў, тунэляў, дарог і інш.

Ствараецца напампоўваннем па буравых свідравінах у шчыліны і поры грунту глініс-тых і цэментавых растворaў (глінізацыя, *цэментацыя*), расплаўленага бітуму або бітумных эмульсій (гарачая і халодная бітумізацыя), вадкага шкла з інш. кампанентамі (*сілікатызацыя грунтоў*), карбамідных і інш. смол (смалізацыя), гарачых газаў пры т-ры 700 °С і вышэй (абпал, або тэрмічнае замацаванне), ахаладжальных растворaў (*замарожванне грунтоў*), а таксама прапусканнем эл. току, дрэніраваннем і інш. *М.М.Кунцэвіч.*

ЗАМАЦАВА́ННЕ ФАТАГРАФІ́ЧНАЕ, фіксаванне фатаграфічнае, выдаленне са святлоадчувальнага слоя фатаграфічных матэрыялаў рэшткаў галоіднага серабра, не ўзноўленага ў час *праяўлення фатаграфічнага*. Садзейнічае працяглай захаванасці фатагр. відарысаў. Ажыццяўляецца з дапамогай растворaў (або пасты) рэчываў (найб. пашыраны тыясульфат натрыю), здольных пераўтвараць галоіднае серабро ў водна-растваральныя злучэнні.

Даліна р. **Замбезі**.

ЗАМБЕ́ЗІ (Zambezi), рака на Пд Афрыкі, у Анголе, Замбіі, Намібіі, Зімбабве, Мазамбіку. Даўж. 2660 км, пл. бас. 1330 тыс. км^2. Пачынаецца на плато Лунда ў Замбіі, каля мяжы з Заірам, упадае ў Мазамбікскі праліў Індыйскага ак. Ад вытоку на працягу 1200 км цячэ па слабанахіленай раўніне, утварае парогі (Катыма, Кебрабаса) і вадаспады (Гонье, Нгамбве, Вікторыя). Да вусця р. Луангва цячэ па горнай мясцовасці ў вузкай (да 40—60 м) скалістай даліне, у ніжнім цячэнні мае ў асноўным шырокую даліну і шырокае рэчышча (да 5—8 км). За 120 км ад вусця ўтварае дэльту з мноствам рукавоў (пл. каля 8 тыс. км^2). Гал. прытокі: злева — Кабомпа, Луэна, Кафуэ, Луангва, Шырэ; справа — Лунгвебунгу, Луангінга, Ліньянці (у верхнім і сярэднім цячэнні Кванда). Да бас. З. адносіцца воз. Ньяса (Малаві). Жыўленне пераважна дажджавое. Паводкі са снеж. да красавіка. У сухі сезон сцёк

вады скарачаецца больш як у 10 разоў. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 16 тыс. м^3/с. Рыбалоўства. Суднаходству перашкаджаюць парогі, асн. суднаходства на тэр. Замбіі і на адным з рукавоў дэльты, дзе размешчаны порт Шындэ (Мазамбік). На З. буйныя ГЭС і вадасх. Карыба і Кабора-Баса. Бас. З. ўпершыню абследаваны англ. падарожнікам Д.*Лівінгстанам* у 1851—56.

ЗА́МБІЯ (Zambia), Рэспубліка Замбія (Republic of Zambia), краіна ва ўнутранай ч. Паўд. Афрыкі. Мяжуе на ПнЗ з Дэмакр. Рэспублікай Конга (б. Заір), на Пн з Танзаніяй, на У з Малаві і Мазамбікам, на Пд з Зімбабве, Намібіяй і Батсванай, на З з Анголай. Пл. 752,6 тыс. км^2. Нас. 8936 тыс. чал. (1993). Дзярж. мова — англійская, але шырока карыстаюцца і мясц. мовамі.

Герб і сцяг **Замбіі**.

Сталіца — г. *Лусака*. Краіна падзяляецца на 9 правінцый. Нац. свята — Дзень незалежнасці (24 кастр.).

Дзяржаўны лад. З. — рэспубліка. Уваходзіць у склад Садружнасці. Паводле канстытуцыі 1991 кіраўніком дзяржавы і ўрада з'яўляецца прэзідэнт, які выбіраецца насельніцтвам на ўсеагульных выбарах на 5 гадоў. Вышэйшы заканадаўчы орган дзяржавы — Нац. сход (аднапалатны парламент), 150 членаў якога выбіраюцца насельніцтвам на 5 гадоў. Выканаўчая ўлада належыць ураду, прэм'ер-міністра і міністраў якога назначае прэзідэнт.

Прырода. Амаль усю краіну займае хвалістае пласкагор'е (выш. 1000—1500 м), складзенае з дакембрыйскіх гранітаў, гнейсаў, крышт. сланцаў. На У горы Мучынга (выш. да 1893 м, г. Мумпу). З. мае запасы медзі сусв. значэння (частка т.зв. «Меднага пояса» на граніцы з Дэмакр. Рэспублікай Конга), кобальт, поліметалы, ванадый, уран, золата, жалеза, каменны вугаль. Клімат субэкватарыяльны з трыма сезонамі — дажджлівым і цёплым (ліст.—крас.), сухім і халаднаватым (май—ліп.), сухім і гарачым (жн.—кастр.). Сярэдняя т-ра самага цёплага месяца (кастр.) каля 20—25 °С, самага халоднага (ліп.) каля 15—20 °С. Ападкаў 750—1500 мм за год. Бываюць засухі. Рачная сетка густая: р. Замбезі з прытокамі Кафуэ, Луангва і інш., вытокі Конга з азёрамі Бангвеулу і Мверу, паўд. ч. воз. Танганьіка. На Замбезі вадасх. Карыба, ёсць парогі і вадаспады, у т.л. вадаспад *Вікторыя*. Агульныя запасы гідраэнергіі больш за 50 млн. кВт. Пераважае саванная расліннасць на чырвона-карычневых глебах. Жывёльны свет разнастайны: ёсць буйныя траваедныя — сланы, насарогі, буйвалы, зебры, жырафы, антылопы; драпежнікі — ільвы, леапарды, гіены. Каля 20 нац. паркаў (Кафуэ, Сіёма-Нгвезі, Паўн. і Паўд. Луангва і інш.).

Насельніцтва. 99% насельніцтва складаюць афрыканцы моўнай сям'і *банту*, у т.л. народы групы цэнтр. банту — бемба (жывуць на Пн і ў цэнтр. частцы, 34%) і тонга (Пд, 16%), групы ўсх. банту — малаві (У, 18%), інш. груп — балунда (ПнЗ), балозі (ПдЗ), нгоні (У), чэва (У). Жывуць таксама еўрапейцы (пераважна англічане і афрыканеры) і выхадцы з Індыі. Сярод вернікаў пераважаюць хрысціяне, у т.л. пратэстанты (35%), католікі (27%), афр. цэрквы (9%). Ёсць невял. групы мусульман (на Пн), індуістаў, прыхільнікаў мясц. культаў. Сяредняя гадавы прырост насельніцтва каля 3%. Сярэдняя шчыльн. 12 чал. на 1 км^2. Найб. шчыльна заселены «Медны пояс» і раёны на Пд ад яго да г. Лусака (50—200 чал. на 1 км^2). У засушлівых мясцінах на З і У шчыльнасць памяншаецца да 1 чал. на 1 км^2. У гарадах жыве каля палавіны насельніцтва (1995). Найб. гарады (тыс. ж., 1990): Лусака — 982,4, Ндола — 467, Кітве-Нкана — 348,6, Кабве — 200,3, Чынгола — 186,8, Муфуліра — 175, Луанш'я — 147,7. У краіне вельмі пашыраны СНІД.

Гісторыя. Тэр. З. заселена з глыбокай старажытнасці. Гэта адно з найстаражытнейшых месцаў апрацоўкі жалеза. Бушменаў, якія прыйшлі сюды, верагодна ў 1-м тыс. да н.э., з 6 ст. н.э. пачалі выцясняць на Пд плямёны банту. У 17—19 ст. тут фарміраваліся раннефеад. дзяржавы плямён лунда, баротсе, бемба, нгоні. Першыя еўрапейцы (партугальцы) на тэр. З. з'явіліся ў канцы 18 ст. У 1880-я г. на тэр. дзяржавы баротсе праніклі агенты Брыт. паўднёва-афр. кампаніі, заснаванай С.Родсам. У 1890 кампанія атрымала ад уладара баротсе Леванікі I выключнае права на эксплуатацыю прыродных багаццяў. У 1891 англічане навязалі пратэктарат дзяржаве баротсе, потым лунда. У 1895 гэтыя тэрыторыі атрымалі афіц. назву Радэзія (ад прозвішча Родса). У 1900 пад кіраванне кампаніі перададзены таксама землі плямён бемба і нгоні. Пачалася эксплуатацыя радовішчаў медзі, у 1903—10 тут пабудавана чыгунка. Еўрап. каланісты набывалі найб. урадлівыя землі, а мясц. насельніцтва выцяснялі ў спец. рэзервацыі. У 1911 тэр. сучаснай З. вылучана ў асобны пратэктарат пад назвай Паўн. Радэзія (у 1924 афіцыйна абвешчана брыт. пратэктаратам). Пасля 1-й сусв. вайны пачалося хуткае развіццё горнаруднай прам-сці, асабліва здабычы медзі. У 1948 створана першая афр. арг-цыя — Кангрэс Паўн. Радэзіі (з 1951 Афр. нац. кангрэс, АНК). У 1953 Паўн. Радэзія разам з Паўд. Радэзіяй (сучасная Зімбабве) і Ньясалендам (сучасная Малаві) увайшлі ў створаную Вялікабрытаніяй Федэрацыю Радэзіі і Ньясаленда, дзе дамінавала еўрап. меншасць з Паўд. Радэзіі. Пасля расколу АНК у 1959 узнікла Аб'яднаная партыя нац. незалежнасці (ЮНІП) на чале з К.Каўндай. У 1962 абвешчана канстытуцыя і створаны каліцыйны ўрад з прадстаўнікоў АНК і ЮНІП на чале з Каўндай. Пасля скасавання федэрацыі (1963) Паўн. Радэзія 24.10.1964 атрымала незалежнасць і прыняла назву З., з 1965 — рэспубліка. Член Садружнасці, член ААН, Арг-цыі афр. адзінства. Прэзідэнтам краіны быў абраны Каўнда (у 1964—73 адначасова кіраўнік урада), які распачаў унутр. рэформы ў рамках абвешчанай у 1969 канцэпцыі «філасофіі гуманізму» (у т.л. кантроль над брыт. і амер. горнапрамысл. кампаніямі). Знешняя палітыка гэтага часу характарызавалася збліжэннем з Танзаніяй і Кітаем, канфліктамі з Паўд.-Афр. рэспублікай (ПАР), калан. ўладамі партуг. Мазамбіка і Радэзіі, падтрымкай вызв. руху ў гэтых краінах. У 1971 адзін з кіраўнікоў ЮНІП С.Капвепве заснаваў апазіцыйную Аб'яднаную прагрэс. партыю (АПП), якая разам з АНК выступіла супраць прэзідэнта Каўнды і ЮНІП. У 1972 улады аб'явілі АПП і АНК па-за законам і абвясцілі З. аднапарт. дзяржавай. У 1975 З. ўвайшла ў кааліцыю прыфрантавых дзяржаў Паўд. Афрыкі, удзельні-



чала ў перагаворах з уладамі ПАР і Нар. арг-цыяй Паўд.-Зах. Афрыкі (СВАПО) па сітуацыі ў Паўд. Афрыцы. У 1976 прэзідэнт Каўнда абвясціў сацыяліст. канцэпцыю т.зв. камунакратыі. Эканам. крызіс, што нарастаў у З. з пач. 1980-х г., стаў прычынай актывізацыі апазіцыі, якая дамагалася ліквідацыі аднапарт. сістэмы (няўдалы дзярж. пераварот ваенных 1990), узнік Рух за шматпарт. дэмакратыю (ММД), які патрабаваў свабодных выбараў і стварэння часовага ўрада. У 1991 прынята новая канстытуцыя, адбыліся выбары, перамогу на якіх атрымаў ММД. Яго лідэр Ф.Чылуба стаў прэзідэнтам.

У краіне дзейнічае шматпарт. сістэма. Асн. партыі: Рух за шматпарт. дэмакратыю і Аб'яднаная партыя нац. незалежнасці.

Да арт. **Замбія**. Вёска на паўночным захадзе краіны (злева). У адным з раёнаў г. Лусака.

Гаспадарка. З. — адна з найменш развітых краін свету. Штогадовы даход на 1 чалавека каля 400 дол. ЗША. Прам-сць дае 46% валавога нац. прадукту, сельская гаспадарка — 18, абслуговыя галіны — 36%. Вядучае месца ў прам-сці належыць горназдабыўной і каляровай металургіі. З 1982 горназдабыўная прам-сць цалкам кантралюецца дзяржавай. З. займае 5-е месца ў свеце па здабычы медзі — каля 500 тыс. т штогод. Буйнейшыя руднікі каля гарадоў Кітве-Нкана, Луанш'я, Муфуліра, Чынгола, Ндола, Рон-Антэлап, Чыбулума. У «Медным поясе» працуюць буйныя медзеплавільныя заводы. З. займае 2-е месца ў свеце па здабычы кобальту; штогадовая здабыча каля 5 тыс. т (каля 15% сусв. вытв-сці). Здабываюць таксама цынк, свінец, берылій, селен, каменны вугаль, аметысты і інш. Вытв-сць электраэнергіі каля 8 млрд. кВт гадз за год. ГЭС Карыба на р. Замбезі (магутнасць каля 700 тыс. кВт) і ГЭС Кафуэ на р. Кафуэ даюць больш за 70% усёй электраэнергіі. Буйная ЦЭЦ у г. Ндола. Частка электраэнергіі экспартуецца ў суседнія краіны. Астатнія галіны прам-сці маюць меншае значэнне. У г. Ндола заканчваецца нафтаправод з Дар-эс-Салама (Танзанія), працуюць нафтаперапр. з-д, шынны камбінат, хім. прадпрыемствы. У г. Луанш'я з-д па вытв-сці электракабелю, вырабаў з медзі і алюмінію, у г. Муфуліра выплаўка другаснага чыгуну і сталі, вытв-сці метал. вырабаў для горнай прам-сці. Там жа і ў г. Кафуэ выраб выбуховых рэчываў. У краіне ёсць асобныя прадпрыемствы хім. (Кітве-Нкана, Лусака, Ндола), па вытв-сці мінер. угнаенняў (Кафуэ), цэменту (Лусака), буд. матэрыялаў (Кітве-Нкана), па зборцы аўтамабіляў і веласіпедаў з імпартаваных дэталей і вузлоў (Лусака, Ндола). Лёгкая прам-сць прадстаўлена галінамі: тэкст. (Кітве-Нкана, Кафуэ), швейнай (Лусака, Кітве-Нкана, Муфуліра, Лівінгстан), гарбарна-абутковай (Кафуэ), мэблевай (Кітве-Нкана, Ндола, Кафуэ), дрэваапр. (Кітве-Нкана, Луанш'я, Лівінгстан), керамічнай (Кітве-Нкана). Параўнаўча развіты харч. (цукр., мясная, мукамольная, піваварная — Лусака, Ндола, Чынгола) і харчасмакавая (пераважна тытунёвая — Луанш'я, Муфуліра, Лівінгстан і інш.) прам-сць. Вытв-сць асобных відаў прамысл. прадукцыі (1994): азотных угнаенняў — 58 тыс. т, фосфарных — 19,2 тыс. т, калійных — 8,3 тыс. т, цукру — 150 тыс. т, прадукцыі лесапілавання — 112 тыс. $м^3$, паперы і кардону — 4 тыс. т, цэменту — 376 тыс. т. Каля 70% жыхароў краіны занята ў сельскай гаспадарцы. Агульная пл. с.-г. зямель каля 7 млн. га, у т.л. пад ворывам каля 2 млн. га. Вылучаюцца 2 сектары: традыцыйны (на 1 гаспадарку прыпадае 1,5 га), вытв-сць харч. культур на свае патрэбы; таварны (каля 1000 буйных ферм па 1000 га). На свае патрэбы вырошчваюць (1994, тыс. т): кукурузу — 1021, пшаніцу — 43, проса — 63, сорга — 35, маніёк — 580, арахіс — 27. Таварныя культуры (1994, тыс. т): цукр. трыснёг — 1311, тытунь — 7, бавоўна — 16. Развіта агародніцтва. Жывёлагадоўля развіта слаба, пераважна на Пд краіны (шкодзяць муха цэцэ, эпідэміі, засухі). Гадуюць буйн. раг. жывёлу (каля 3 млн. галоў), коз і авечак (каля 0,4 млн. галоў), свіней (каля 0,3 млн. галоў). Развіта птушкагадоўля. Штогод ловяць каля 60—70 тыс. т рыбы. Аснова трансп. сеткі — чыгункі Ндола—Лівінгстан і Капіры-Мпошы—Дар-эс-Салам (Танзанія) з адгалінаваннямі. Агульная даўж. чыгунак 2164 км. Аўтадарог каля 37 тыс. км, з іх каля 6,7 км з цвёрдым пакрыццём. Краіна залежыць ад доступу да марскіх партоў ПАР, Анголы, Танзаніі. Міжнар. аэрапорты ў гарадах Лусака, Ндола, Лівінгстан. Экспарт і імпарт З. прыкладна роўныя — па 1 млрд. дол. ЗША штогод. З. экспартуе медзь (85% экспарту па кошце), кобальт (6%), цынк, свінец, тытунь і інш., імпартуе машыны і трансп. сродкі (38%), хім. і харч. прадукты, разнастайныя прамысл. вырабы. Замежны гандаль вядзецца пераважна з ЗША, Японіяй, Вялікабрытаніяй, Германіяй, ПАР. Грашовая адзінка — квача.

Літ.: Березин В.И. Замбия: Пути завоевания экон. независимости. М., 1972; Перышкин Е.В. Политическая система Республики Замбии. М., 1980.

Ю.В.Ляшковіч (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *Н.К.Мазоўка* (гісторыя).

ЗАМБРЖЫ́ЦКІ Станіслаў Валянцінавіч (1823, в. Вязынка Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. — 1.10.1907), бел. паэт, краязнавец. З літ. твораў З. захавалася вершаванае апавяданне «Гутарка Сталюка» (1870—90-я г.), у якім паказаў побыт народа, нікчэмнасць фанабэрыстай шляхты, даў узоры бел. гутарковай мовы. Вывучаў курганы на радзіме, першы апісаў Вязынкаўскае гарадзішча. У 1881—83 бацька Я.Купалы арандаваў у З. зямлю.

Літ.: Каханоўскі Г. Аўтар знайшоўся // ЛіМ. 1979. 2 лют.

Г.А.Каханоўскі.

ЗАМЕ́ЖНЫЯ ГРАМАДЗЯ́НЕ, асобы, якія не з'яўляюцца грамадзянамі пэўнай дзяржавы і маюць доказы сваёй прыналежнасці да грамадзянства замежнай краіны. Іх прававое становішча вызначаецца нац. заканадаўствам дзяржавы месцазнаходжання і заключанымі міжнар. дагаворамі і пагадненнямі. Нац. заканадаўства звычайна адрозніває некалькі катэгорый З.г.: якія пастаянна пражываюць на тэр. дзяржавы, якія часова знаходзяцца ў дзяржаве, замежныя прадстаўнікі, якія валодаюць дыпламат. імунітэтам, бежанцы. Прававое становішча кожнай катэгорыі мае свае асаблівасці. У Рэспубліцы Беларусь правы і абавязкі З.г. вызначаюцца Канстытуцыяй, адпаведным законам, міжнар. дагаворамі. З.г. на тэр. Беларусі карыстаюцца правамі і свабодамі і выконваюць абавязкі нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй, законамі і міжнар. дагаворамі (у прыватнасці, З.г. не валодаюць выбарчым правам, не могуць прымаць удзел у рэферэндумах, пазбаўлены абавязкаў ваен. службы і інш.).

Г.А.Маслыка.

ЗАМЕ́ЖНЫЯ ПАХО́ДЫ РУ́СКАЙ А́РМІІ 1813—14, сумесныя з войскамі Прусіі, Швецыі і Аўстрыі баявыя дзеянні рус. арміі супраць войск *Напалеона I* на тэр. Польшчы, Германіі і Францыі. Мелі на мэце вызваленне краін Зах. Еўропы ад напалеонаўскага панавання, аднаўленне і ўмацаванне феад.-абсалютысцкіх рэжымаў, што існавалі ў іх да

Французскай рэвалюцыі 1789—99 і *напалеонаўскіх войнаў*. Да канца зімовай кампаніі 1812—13 аб'яднаныя войскі Расіі і Прусіі (27—28.2.1813 Прусія заключыла з Расіяй саюзны дагавор) пад камандаваннем М.І.*Кутузава* вызвалілі ад напалеонаўскіх войск герцагства Варшаўскае, Усх. Прусію і сталіцу Прусіі г. Берлін, уступілі на тэр. Саксоніі і Баварыі. 2.5.1813 пад Лютцэнам і 20—21 мая пад Баўтцэнам саюзная армія пад камандаваннем П.Х.Вітгенштэйна (змяніў М.І.Кутузава, які памёр 28.4.1813) пацярпела паражэнні. 29.5.1813 новым галоўнакамандуючым прызначаны М.Б.*Барклай дэ Толі*. 10.8.1813 вайну Францыі аб'явіла Аўстрыя, да антыфранц. кааліцыі далучыліся Вялікабрытанія і Швецыя. Да восені 1813 баявыя дзеянні ішлі з пераменным поспехам. 16—19.10.1813 аб'яднаныя рус.-аўстр.-прус.-швед. сілы нанеслі вырашальнае паражэнне арміі Напалеона І у *Лейпцыгскай бітве 1813* («бітва народаў»), пасля чаго напалеонаўскія войскі пакінулі Германію і адышлі за р. Рэйн. Да студз. 1814 сілы антыфранц. кааліцыі (453 тыс. чал., у т.л. 153 тыс. рускіх) фарсіравалі Рэйн. Пасля шэрагу бітваў на тэр. Францыі 30.3.1814 перад саюзнай арміяй (100 тыс. чал., у т.л. 64 тыс. рускіх) капітуляваў г. Парыж. 6.4.1814 Напалеон І адрокся ад прастола. 30 мая паміж саюзнікамі і Францыяй падпісаны *Парыжскі мірны дагавор 1814*.

Літ.: Манфред А.З. Наполеон Бонапарт. 5 изд. М., 1989; Поход русской армии против Наполеона в 1813 г. и освобождение Германии: Сб. док. М., 1964; Освободительная война 1813 г. против наполеоновского господства. М., 1965.

ЗА́МЕНГОФ (Zamenhof) Людвік Лазар (27.12.1859, г. Беласток, Польшча — 27.4.1917), польскі ўрач-акуліст, стваральнік *эсперанта*. Вучыўся ў Варшаве, Маскве і Вене. У 1893—97 жыў у г. Гродна. У 1887 выдаў (пад псеўд. D-ro Esperanto) праект штучнай дапаможнай міжнар. мовы, спадзеючыся, што яна дапаможа ў справе ўзаемаразумення паміж народамі. Пазней апубл. слоўнікі эсперанта, хрэстаматыі і асобныя выданні сваіх арыгінальных твораў, а таксама пераклады на эсперанта сусв. маст. класікі.

ЗА́МЕЦЬ, пранос снегу ветрам непасрэдна над паверхняй снегавога покрыва; разнавіднасць мяцеліцы.

ЗАМІНДА́РЫ (ад перс. — землеўладальнік), зямельна-падатковая сістэма ў Паўн., Усх. і Цэнтр. Індыі ў часы англ. калан. панавання. Уведзеная англ. каланіяльнымі ўладамі на мяжы 18 і 19 ст. Зацвярджала ў правах спадчынных землеўладальнікаў феадалаў — заміндараў і ўстанаўлівала зямельны падатак з іх (пастаянны і часовы) на карысць вярхоўнага ўласніка зямлі — калан. улад. Сістэма З. адменена ў 1950-я г.

ЗАМІРА́ННЕ РАДЫЁСІГНА́ЛУ, федынг, змяншэнне інтэнсіўнасці радыёсігналу ў пункце яго прыёму. Абумоўлена зменамі эл. уласцівасцей атмасферы, а таксама інтэрферэнцыяй радыёхваль, што прыйшлі ў пункт прыёму па розных напрамках (гл. *Інтэрферэнцыя хваль, Распаўсюджванне радыёхваль*). З.р. прадухіляюць з дапамогай аўтам. рэгуліроўкі ўзмацнення, прыёму на некалькі разнесеных антэн і інш.

ЗАМІ́Р'Е, назва чыг. ст. *Гарадзея* ў пач. 20 ст.

ЗА́МКАВАЯ ГАРА́, найвышэйшы пункт *Навагрудскага ўзвышша* на Беларусі. За 3 км ад г. Навагрудак, за 250 м на Пн ад в. Пуцэвічы. Выш. 323 м. Складзена з марэны *сожскага зледзянення*, укрыта пылаватым супескам, сфарміраваным у час *паазерскага зледзянення*. Мае выгляд спадзіставыпуклага ўзвышэння субмерыдыянальнага напрамку. Схілы спадзістыя, стромкасць 3—7°, адносныя перавыш. да 20—25 м/км^2. Амаль уся пад ворывам. На З.г. засталіся руіны *Навагрудскага замка* (10—16 ст.). Паблізу З.г. ў гонар А.Міцкевіча насыпаны курган.

ЗА́МКАВЫ СУД, гл. ў арт. *Гродскі суд*.

ЗАМКНЁНАЯ ТЭЛЕВІЗІ́ЙНАЯ СІСТЭ́МА, адна- ці шматканальная сістэма прыкладнога *тэлебачання*, у якой перадавальныя камеры звязаны з прыёмнікамі мясцовымі кабельнымі лініямі сувязі. Кіраванне камерамі дыстанцыйнае або яны працуюць у аўтам. рэжыме. Параметры З.т.с. вызначаюцца яе прызначэннем і могуць адрознівацца ад вышчальных телевізійных стандартаў. Выкарыстоўваецца ў прамысл. тэлебачанні, навуч. установах, ваеннай справе, на транспарце, у медыцыне і інш.

ЗАМКНУ́ТЫЯ ЭКАЛАГІ́ЧНЫЯ СІСТЭ́МЫ, функцыянальна адзіная сукупнасць арганізмаў (раслін, жывёл і мікраарганізмаў), якія насяляюць агульную тэр. і здольныя да працяглага існавання пры цалкам замкнутым кругавароце рэчываў (пры адсутнасці матэрыяльнага абмену праз яе межы).

Прынцыпы З.э.с. выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы біял. сістэм жыццезабеспячэння чалавека ва ўмовах ізаляцыі ад біясферы Зямлі, напр. у касм. або падводных апаратах. Аснову штучна створанай З.э.с. складаюць расліны, якія за кошт энергіі святла ў працэсе фотасінтэзу паглынаюць двухвокіс вугляроду і выдзяляюць кісларод. Біямаса раслін выкарыстоўваецца ў ежу чалавекам і інш. гетэратрофнымі арганізмамі, апошнія могуць уваходзіць у харч. рацыён чалавека. Нявыкарыстаная біямаса раслін, прадукты жыццядзейнасці чалавека і інш. кампанентаў біякомплексу раскладаюцца мікраарганізмамі да вады, двухвокісу вугляроду і мінер. рэчываў, якія зноў выкарыстоўваюцца раслінамі. Створаны эксперым. З.э.с., што ўключаюць чалавека, аднаклетачныя водарасці, вышэйшыя расліны, мікраарганізмы-мінералізатары. За кошт рэгенерацыі ў такіх З.э.с. цалкам забяспечвалася патрэба чалавека ў кіслародзе, вадзе і часткова ў ежы.

ЗАМО́ВЫ, устойлівыя рытмізаваныя празаічныя творы формульнага характару, якім прыпісвалася сіла магічнага ўздзеяння ў патрэбным для чалавека кірунку; адзін з найб. стараж. жанраў *фальклору*. Нар. назвы: шэпты, загаворы, словы, малітвы і інш. У аснове іх класіфікацыі утылітарная накіраванасць. Паводле быт. выкарыстання — універсальны жанр. У адпаведнасці з прызначэннем і тэматыкай З. падзяляюцца: на гаспадарчыя (пры паляванні, лоўлі рыбы, развядзенні пчол, с.-г. работах, для захавання статку і інш.); ахоўныя ад злых духаў і шкодных істот, прыродных з'яў, ад звяроў і гадаў; лекавыя (ад хвароб і прафілактычныя); любоўныя (прысушкі, адсушкі, любжы, вясельныя, на лад у сям'і); сац. зместу (ад несправядлівага суда, салдацкія і інш.). Паводле кампазіцыі маналагічныя і дыялагічныя. Пастаянныя элементы структуры: малітоўны ўступ, зачын, эпічная частка, закрэпка. Уступныя і заключныя формулы часам слаба звязаны з сюжэтам і пераходзяць з твора ў твор. Разнастайныя формулы асноўнай, эпічнай часткі: формулы пераліку, невыканальнай умовы, застрашвання, пагрозы, месца выгнання, забароны і інш. З. уласцівы антрапамарфізм, персаніфікацыя з'яў, хвароб, духаў, усяго, супраць чаго яны накіраваны. Мастацкія прыёмы ў З. (параўнанні, паралелізмы, метафары, эпітэты) падпарадкаваны практычнай прадвызначанасці і апіраюцца на веру ў магічную сілу прамоўленага слова.

Публ.: Замовы. Мн., 1992.

Літ.: Романов Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 5. Витебск, 1891; Астахова А.М. Художественный образ и мировоззренческий элемент в заговорах. М., 1964; Толстой Н.И. Из наблюдений над полесскими заговорами // Славянский и балканский фольклор. М., 1986; Барташэвіч Г.А. Магічнае слова. Мн., 1990. *Г.А.Барташэвіч.*

ЗАМО́ЙСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Zamojskie), адм.-тэр. адзінка на ПдУ Польшчы. Пл. 6986 км^2, нас. 493 тыс. чал., гарадскога 30,3% (1993). Адм. ц. — г. *Замасць*. Найб. гарады: Тамашаў-Любельскі, Грубешаў, Білгорай, Шчэбжэшын. На Пн займае ўсх. ч. Замойскай даліны, на Пд — узв. Расточэ. Клімат умерана кантынентальны. Ся-

рэдняя т-ра студз. -4,5 °С, ліп. 18,5 °С, ападкаў 600—660 мм за год. Гал. рэкі: Буг з прытокам Гучва, Вепш, Танеў. Глебы ўрадлівыя (чарназёмы і буразёмы). Пад лесам 22,6% тэр. (найб. пушча Сольская). Пераважае сельская гаспадарка. Пад с.-г. ўгоддзямі 70,2% тэр., у т.л. 58% пад ворывам. Вырошчваюць пшаніцу, ячмень, цукр. буракі, хмель, тытунь, каноплі, кармавыя культуры. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, коней, птушак. Прам-сць: харчасмакавая (цукр., алейна-тлушчавая, мукамольна-крупяная, агароднінакансервавая, піваварная), лёгкая (швейная, трыкат.), дрэваапр. (мэблевая). Вытв-сць буд. матэрыялаў (кераміка).

ЗАМО́ЙСКІ (Zamoyski) Ян (19.3.1542, Скокаўка, каля г. Замасць, Польшча — 3.6.1605), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, гуманіст. Канцлер вялікі каронны (з 1578), адначасова гетман вялікі каронны (з 1581). Вучыўся ва ун-тах Парыжа, Рыма, Падуі (у апошнім у 1563 рэктар). Пасля вяртання ў Рэч Паспалітую каралеўскі сакратар (з 1565). Прыхільнік *Габсбургаў*, падтрымаў абранне каралевай *Ганны Ягелонкі*. Спрыяў узвядзенню на трон *Стафана Баторыя*, быў яго бліжэйшым паліт. дарадцам; пры кіраванні ўнутр. і знешняй палітыкай імкнуўся да ўзмацнення каралеўскай улады. Пасля смерці Баторыя падтрымаў *Жыгімонта III* Вазу; быў прыхільнікам яго прагабсбургскай палітыкі і ў 1605 узначаліў апазіцыю. Заснаваў г. *Замасць* (1580), Замойскую ардынацыю (1589), Замойскую акадэмію (1595).

Літ.: Grzybowski S. Jan Zamoyski. Warszawa, 1994. *Н.К.Мазоўка.*

ЗАМО́К, 1) прыстасаванне для запірання памяшканняў, ёмістасцей, скрынь, шафаў і інш. Вядомы з 2-га тыс. да н.э. (Асірыя, Вавілон, Егіпет). Бываюць бессувальдныя (сакрэт забяспечваецца ў асн. профілем замочнай шчыліны), сувальдныя (з наборам рознафігурных рухомых пласцінак — сувальд, якім адпавядаюць выступы ключа), цыліндравыя (сувальды зроблены ў выглядзе штыфтоў), сакрэтныя (з літарным або лічбавым шыфрам); здымныя (у т.л. вісячыя) і нерухомыя (убудаваныя, уразныя, накладныя), а таксама спец. З. для ювелірных вырабаў. 2) Прыстасаванне, якое забяспечвае стопаранне рухомых частак машын і механізмаў. Напр., З. гаечны перашкаджае самаадкручванню гаек і інш. разьбовых дэталей пры рабоце машын. 3) Спец. злучэнне нерухомых частак драўляных канструкцый, зрубаў. 4) У агнястрэльнай зброі прыстасаванне для запальвання кідальнага снарада пры выстрале. Зброевыя З.: кнотавы (вядомы з 15 ст.), калясцовы (з вярчальным колам для высякання іскраў з крэменю, канец 15 — пач. 16 ст.), ударна-крамянёвы (16 ст.), ударна-капсульны (пач. 19 ст.).

ЗАМО́К (замковы камень) у архітэктуры, камень ці цагліна (звычайна клінападобныя) у вяршыні *аркі* або *скляпення*. Дэкар. З. часам упрыгожвалі цэнтр. ч. плоскай перамычкі над аконным праёмам (будынак б. мужчынскай гімназіі ў Гомелі) або *парталам*. У бел. архітэктуры найб. шырока выкарыстоўваліся ў стылях класіцызму, неакласіцызму, мадэрн, у архітэктуры 1950-х г. З. часта аздабляліся арнаментам, арх. дэталямі (мадульёнамі і інш.), скульптурай.

Замок у афармленні акна будынка былой мужчынскай гімназіі ў Гомелі.

ЗАМО́Р, масавая гібель рыбы і інш. водных жывёл. Адбываецца пры памяншэнні колькасці растворанага ў вадзе кіслароду (да 5—30% нармальнага насычэння) або са з'яўленнем у вадзе атрутных рэчываў у выніку скідвання прамысл. неачышчаных сцёкавых вод ці змыву з сушы ядахімікатаў. Колькасць кіслароду памяншаецца ў вадаёмах, багатых арган. рэчывамі (напр., балотныя воды), у стаячых вадаёмах у перыяд інтэнсіўнага развіцця водарасцей («цвіценне» вады) і зоапланктону. З. бывае летам у начны час у ціхае цёплае надвор'е і зімой пад ільдом (пераважна са студзеня да красавіка).

З'ява З. звязана з празмерным эўтрафіраваннем вадаёмаў. Да недахопу кіслароду найб. адчувальныя некат. рыбы (ласасёвыя, асятровыя, акунёвыя), ракі, малюскі (бяззубкі, перлаўкі) і інш.; менш адчувальныя вугры, карасі, ліні, уюны, лічынкі хіранамід і інш. Папярэджваюць З. насычэннем вады кіслародам у працэсе яе аэрацыі, аховай вадаёмаў ад забруджвання і атрутных рэчываў, павелічэннем іх праточнасці. На Беларусі З. найчасцей у азёрах Палесся і р. Прыпяць.

Замосценскі касцёл.

ЗАМО́СЦЕ, вёска ў Нахаўскім с/с Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса. За 41 км на ПнУ ад Калінкавіч, 104 км ад Гомеля, 5 км ад чыг. ст. Нахаў. 561 ж., 285 двароў (1997). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЗАМО́СЦЕ, вёска ў Покрашаўскім с/с Слуцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 25 км на Пн ад Слуцка, 90 км ад Мінска, 29 км ад чыг. ст. Слуцк. 769 ж., 278 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік архітэктуры — *Замосценскі касцёл* (1649). Каля вёскі — гарадзішча.

ЗАМО́СЦЕНСКІ КАСЦЁЛ, помнік архітэктуры рэнесансу. Пабудаваны каля 1620 (па інш. звестках у 1649) А.С.Вінкаю-Ратомскім у в. Замосце (Слуцкі р-н Мінскай вобл.). У 17 ст. пры З.к. была місія езуітаў, у 1865 забраны пад царкву. Мураваны 1-нефавы храм складаецца з квадратнага ў плане асн. аб'ёму, 5-граннай алтарнай апсіды і вежападобнага бабінца. Сцены нефа аздоблены тонкімі пілястрамі і завершаны прафіляваным карнізам. Вокны высокія, з паўцыркульным завяршэннем. Бабінец з трохвугольным франтонам і руставаным арачным уваходам, верагодна, перабудаваны ў 19 ст. Над ніжнім ярусам крыжовае скляпенне, вокны з лучковымі завяршэннямі. Грані апсіды прымыкаюць да нефа пад косым вуглом, па баках — выцягнутыя ўпоперак сакрысціі (рызніцы). *А.А.Ярашэвіч.*

ЗАМО́ЦІН Іван Іванавіч (1.11.1873, в. Крывуліна Цвярской вобл., Расія — 25.5.1942), рускі і бел. літ.-знавец. Акад. АН Беларусі (1928), чл.-кар. АН СССР (1929), д-р філал. н. (1934). Скончыў Пецярбургскі гісторыка-філал. ін-т (1897). З 1904 прыват-дацэнт Варшаўскага, потым Пецярбургскага, з 1908 праф. Варшаўскага, з 1917 — Данскога ун-таў, з 1922 — БДУ, з 1931 — Мінскага пед. ін-та. Адначасова працаваў у Інбелкульце (з 1925), АН БССР (з 1929). 4.4.1938 арыштаваны, высланы ў Комі АССР, дзе памёр у турэмнай бальніцы. У працах па гісторыі рус. л-ры 19 ст. выступаў як прадстаўнік *культурна-гістарычнай школы* ў літ.-знаўстве. Даследаваў эстэт. прынцыпы, літ. плыні і стылі рус. рамантычнай л-ры 1820—30-х г. ва ўзаемасувязях з зах.-еўрап. л-рай, станаўленне рэаліст. метаду ў рус. л-ры 1840—60-х г. (творчасць М.Гогаля, В.Бялінскага, М.Чарнышэўскага, І.Тургенева, Ф.Дастаеўскага, Л.Талстога і інш.), гісторыю рус. крытыкі і журналістыкі, праблемы рус. л-ры канца 19 — пач. 20 ст. Вывучаў гісторыю і тэорыю бел. л-ры [«Пуціны беларускай літаратуры (Я.Колас — «Новая зямля»)», 1924; «Паэма Я.Коласа «Сымон-музыка» як аўтахарактарыс-

тыка», 1926; «Чарговыя задачы вывучэння гісторыі беларускай літаратуры», 1928, і інш.]. Працы З. садзейнічалі станаўленню бел. тэксталогіі (акад. выданне твораў М.Багдановіча, 1927—28, і інш. пісьменнікаў), методыкі выкладання л-ры.

Тв.: Романтизм двадцатых годов XIX ст. в русской литературе. Т. 1—2. Варшава, 1903—07; Сороковые и шестидесятые годы. Варшава, 1911; М.А.Багдановіч // Узвышша. 1927.

І.І.Замоцін.

М.М.Замяцін.

№ 2, 3, 5; Беларуская драматургія. [Ч.] 1. Драматычныя творы Я.Купалы // Тамсама. № 1; Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні. Вып. 1—2. Мн., 1927—28; Драматычныя творы Ц.Гартнага // Полымя. 1928. № 9; А.С.Пушкін: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1937; Творы. Мн., 1991. *У.М.Конан.*

ЗАМО́ШША, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ушача (працякае праз возера), за 18 км на ПдЗ ад г.п. Ушачы. Пл. 0,33 км^2, даўж. 1,2 км, найб. шыр. 520 м, найб. глыб. 30,7 м, даўж. берагавой лініі 3,3 км. Пл. вадазбору 135 км^2. Схілы катлавіны выш. 10—20 м, разараныя, на Пд і ПдУ параслі лесам. Берагі зліваюцца са схіламі, на Пд і ПдУ нізкія, пясчаныя, пад хмызняком. Найб. глыб. ў паўд. плёсе, у паўн. — 17,9 м. Паміж плёсамі невял. востраў. Дно да глыб. 6—7 м пясчанае, ніжэй — глеістае. Уваходзіць у зону курорта Ушачы.

ЗАМО́ШША, вёска ў Ахрэмавіцкім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на аўтадарозе Браслаў—Шаркаўшчына. Цэнтр калгаса. За 20 км на Пд ад Браслава, 258 км ад Віцебска, 20 км ад чыг. ст. Шаркаўшчына. 369 ж., 126 двароў (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Каля вёскі — гарадзішча і курганны могільнік.

ЗА́МЧЫШЧА, месца з рэшткамі разнастайных сярэдневяковых умацаванняў, якія ўключалі комплекс абарончых і жылых пабудоў на тэр. *дзядзінца* (земляныя валы са сценамі, вежамі і інш. элементы абароны). У Беларусі З. называюцца рэшткі ўмацаваных паселішчаў розных часоў, якія ўключалі *гарадзішчы*, гар. цытадэлі, каралеўскія і прыватнаўласніцкія замкі. На даследаваных З. (Ваўкавыск, Мінск, Навагрудак, Полацк і інш.) выяўлены драўляныя і мураваныя фартыфікацыйныя збудаванні, прадметы матэрыяльнай культуры (зброя, посуд, буд. і ваенны рыштунак, арх.-дэкар. кераміка).

ЗА́МША (польск. zamsz), 1) скура тлушчавага ці камбінаванага (фармальдэгідна-тлушчавага) *дублення*, якую вырабляюць са шкур аленя, авечкі і інш. Вызначаецца мяккасцю, аксамітістасцю, воданепранікальнасцю, значнай сітаватасцю. Афарбоўваюць у розныя колеры (неафарбаваная — светла-жоўтая). Выкарыстоўваюць для вырабу абутку, адзення, пальчатак. З. ш т у ч н у ю вырабляюць прамочваннем тканіны з замшападобным ворсам гумавым клеем (для абутку) ці нанясеннем здробненых баваўняных валокнаў на слой гумавага клею на тканіне (для галантарэйных вырабаў). 2) Баваўняная тканіна атласнага перапляцення нітак з начасаным ворсам на добрым баку.

ЗАМЫКА́ННЕ ЭЛЕКТРЫ́ЧНАЕ, замыканне эл. ланцуга на вельмі малое (блізкае да нуля) супраціўленне. Гл. *Кароткае замыканне.*

ЗАМЫСЛО́ЎСКІ Ягор Ягоравіч (18.6.1841, г. Гродна — 21.5.1896), расійскі гісторык. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1888). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1862), у 1867—71 выкладаў у Аляксандраўскім ліцэі, з 1871 праф. Гісторыка-філал. ін-та ў Пецярбургу, у 1884—90 — Пецярбургскага ун-та. Асн. працы па крыніцазнаўстве гісторыі Расіі і Беларусі 16—17 ст., у т.л. «Цараванне Фёдара Аляксеевіча» (ч. 1, 1871), «Сказанне Масы і Геркмана пра смутны час у Расіі» (1874), «Герберштэйн і яго гісторыка-геаграфічныя весці пра Расію» (1884), «Зносіны Расіі з Польшчай у цараванне Фёдара Аляксеевіча» (1887) і інш. Пад яго рэдакцыяй складзены вучэбны атлас па рас. гісторыі з каментарыямі, выдадзена «Гісторыя расійскіх ордэнаў».

ЗАМЯТА́ЛІН Уладзімір Пятровіч (н. 14.5.1948, г. Тула, Расія), дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. Скончыў Данецкае вышэйшае ваенна-паліт. вучылішча (1973), Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна (1983). У 1973—91 на паліт. рабоце ў Сав. Арміі: нам. камандзіра роты, батальёна, вузла сувязі, палка па паліт. частцы, нам. нач. палітаддзела дывізіі, арганізац.-парт. работы палітупраўлення, аддзела сац.-прававой работы ваенна-паліт. ўпраўлення БВА. З 1992 нам. нач. ўпраўлення інфармацыі — нач. прэс-цэнтра Мін-ва абароны Рэспублікі Беларусь. У 1994—97 прэс-сакратар Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нач. Гал. ўпраўлення грамадска-паліт. інфармацыі, нам. кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У студз.—ліп. 1997 старшыня Дзярж. к-та Рэспублікі Беларусь па друку. З ліп. 1997 нам. Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

ЗАМЯ́ЦІН Мікалай Мітрафанавіч (18.5.1900, г. Ліпецк, Расія — 12.7.1965), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Чл.-кар. АН Беларусі (1947), д-р с.-г. н. (1937), праф. (1935). Скончыў Петраградскі вет.-зоатэхн. ін-т (1923). З 1946 заг. аддзела Ін-та сацыяліст. сельскай гаспадаркі АН Беларусі, з 1949 заг. кафедры БСГА, з 1959 — Гродзенскага с.-г. ін-та. Навук. працы па вывучэнні канстытуцыі с.-г. жывёл і падборы іх паводле прынцыпу стымулявання развіцця патомства, узроставага і палавога падбору. Адзін з аўтараў пароднай групы бел. чорна-пярэстых свіней.

ЗАМЯ́ЦІН Яўген Іванавіч (1.2.1884, г. Лебядзянь Ліпецкай вобл., Расія — 10.3.1937), рускі пісьменнік. Скончыў Пецярбургскі політэхн. ін-т (1908). У гратэскна-сатыр. аповесці «Павятовае» (1913) паказаў непрыгляднае правінцыяльнае жыццё. За антываен. накіраванасць аповесці «На кулічках» (1914) прыцягваўся да суда. Гал. твор — раман-антыутопія «Мы» [1920, апубл. на англ. (1924) і франц. (1929) мовах, на рус. мове — ў 1988]. У фантаст.-алегарычных казках-прытчах «Пячора» (1920), «Мамай» (1921), п'есе «Агні святога Дамініка» (1923), гіст. трагедыі «Атыла» (1928) праводзіў думку пра рэальную магчымасць дэградацыі чалавецтва да пячорнага стану. У 1931 эмігрыраваў, з 1932 жыў у Парыжы. Аўтар публіцыстычнага даследавання «Масква—Пецярбург» (1933), рамана «Біч Божы» (1938, незакончаны), кнігі артыкулаў і ўспамінаў пра сучаснікаў «Тварыы» (1955).

Тв.: Собр. соч.: В 5 т. Т. 1—4. Мюнхен, 1970—88; Избр. произв. Т. 1—2. М., 1990; Бич Божий: Избр. Мн., 1997. *С.Ф.Кузьміна.*

ЗАМЯШЧА́ЛЬНЫЯ ВІ́ДЫ, гл. *Вікарыруючыя віды.*

ЗАМЯШЧЭ́ННЕ РЭА́КЦЫІ, хімічныя рэакцыі, якія адбываюцца з абменам атамаў ці груп атамаў у малекуле на інш. атамы ці групы. Найб. пашыраны ў арган. хіміі.

З.р. наз. звычайна па назве атама ці групы атамаў, якія ўваходзяць у малекулу субстрату: *алкіліраванне, ацыліраванне, азаспалучэнне, нітраванне* і інш. Да З.р. адносяцца абменныя рэакцыі, у якіх адным з рэагентаў з'яўляецца растваральнік (напр., аманоліз, гідраліз), і кандэнсацыі рэакцыі, калі ў працэсе замяшчэння адымаецца якая-н. простая неарган. (напр., вада) ці арган. (напр., этылавы спірт) малекула. У хіміі неарганічных злучэнняў З.р. — рэакцыі паміж простым і складаным рэчывамі, напр., выцясненне металу з воднага раствору солі пад уздзеяннем інш. металу: $Fe + CuSO_4 = FeSO_4 + Cu$. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ЗАН (Zan) Тамаш (21.12.1796, в. Мясата Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. — 19.7.1855), польскі паэт-рамантык, удзельнік вызв. руху. Скончыў Віленскі ун-т (1820). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў віленскіх тайных т-ваў і студэнцкай моладзі — філаматаў, філарэтаў і прамяністых. У 1823 арыштаваны, у 1844 высланы ў Арэнбург, дзе вёў дзённік, даследаваў прыроду Урала, стварыў мінералагічны музей. З 1841 на Беларусі, вывучаў бел. фальклор. Аўтар

паэм «Кошачка», «Табакерка», «Мёд», балад «Свіцязь-возера», «Твардоўскі», вершаў, элегій, трыялетаў, камедыі «Грэцкія піражкі» (1817; дзеянне адбываецца ў Мінску).

Тв.: Triolety i wiersze miłosne. Warszawa, 1922. *А.В.Мальдзіс.*

ЗАНА́ЛЬНАСЦЬ ГЕАГРАФІ́ЧНАЯ, 1) на сушы — заканамерная і паслядоўная змена *паясоў геаграфічных* ад экватара да полюсаў (шыротная пояснасць), ад падножжа гор да вяршынь у залежнасці ад вышыні (вышынная пояснасць) і *зон геаграфічных* у межах гэтых паясоў. Шыротная пояснасць выклікана пераважна нераўнамерным размеркаваннем прамянёвай энергіі Сонца паводле геагр. шыраты. Вышынная пояснасць абумоўлена заканамерным для трапасферы паніжэннем т-ры (каля 0,6 °С на 100 м). У межах шыротнай і вышыннай пояснасці З.г. ўскладняецца мясц. адрозненнямі ва ўмовах увільгатнення, араграфічных і літалагічных асаблівасцей тэрыторыі, уздзеяннем цыркуляцый атмасферы і акіянічных цячэнняў. Найб. З.г. адлюстроўваецца ў занальнасці глеб, расліннасці, кліматычных асаблівасцей і інш. 2) У акіяне назіраецца менш выразная паверхневая (або шыротная), вертыкальная (або глыбінная да 1500—2000 м) і донная занальнасць. Найб. выразна З.г. шыротная праяўляецца да глыб. 100—150 м, дзе фарміруюцца асн. ўласцівасці Сусв. ак. пад уздзеяннем сонечнай энергіі. На фоне занальных назіраюцца прыродныя ўтварэнні азанальнага характару, якія могуць перасякаць некалькі зон (даліны рэк) або знаходзіцца ў розных зонах (балота і інш.) і пры гэтым захоўваць асабістыя ўласцівасці. Гл. арт. *Азанальнасць, Азанальная расліннасць* і інш. *В.С.Аношка.*

ЗАНА́ЛЬНАСЦЬ ПАДЗЕ́МНЫХ ВОД, заканамерныя прасторавыя змены фіз.-хім. і дынамічных параметраў падземных вод. Існуюць шыротная (кліматычная) і вертыкальная (геалагічная) З.п.в. У шыротнай занальнасці, характэрнай для прыпаверхневай ч. падземнай гідрасферы планеты, вылучаюць лядовую, гумідную і арыдную макразоны з уласцівымі ім асаблівасцямі фарміравання рэсурсаў падземных вод, хім. саставу і т-ры. Вертыкальная занальнасць выяўляецца ў паслядоўнай змене з глыбінёй хуткасці руху падземных вод, хім. і газавага саставу, т-ры, ціску і інш. Па тэмах водаабмену вылучаюць гідрагеадынамічныя зоны: верхнюю — інтэнсіўнага, сярэднюю — запаволенага, ніжнюю — вельмі запаволенага водаабмену. Вертыкальная гідрагеахім. З.п.в. характарызуецца паслядоўнай зменай з глыбінёй прэсных падземных вод (мінералізацыя да 1 г/л), салёнымі водамі (1—35 г/л), а потым расоламі (больш за 35 г/л). *В.І.Пашкевіч.*

ЗАНА́ЛЬНАСЦЬ РУ́ДНЫХ РАДО́ВІШЧАЎ, заканамерная змена ў прасторы мінер. або структурна-тэкстурных асаблівасцей руд.

Адрозніваюць занальнасць першасную, абумоўленую працэсамі фарміравання радовішчаў карысных выкапняў, і другасную, звязаную з пераўтварэннем рудных цел каля паверхні Зямлі пры акісленні. Вылучаюць занальнасць: рудных правінцый (фарміраванне груп радовішчаў паслядоўна разам з эвалюцыяй зямной кары), рудных палёў (чаргаванне пакладаў руд розных металаў пры пераходзе ад аднаго краю поля да другога), рудных цел (змена мінер. і метал. саставу руд у межах цела). Тэмпературная рудная занальнасць утвараецца ад паніжэння ціску і т-ры рудаўтваральных растворaў па меры аддалення ад магматычнага ачага. На фарміраванне З.р.р. значна ўплываюць рудаўтваральныя растворы пры пульсацыйным паступленні ў прастору рудаадкладання. Вертыкальная занальнасць заключаецца ў змене (з набліжэннем да паверхні Зямлі) высокатэмпературных радовішчаў вальфраму, волава, малібдэну і вісмуту сярэдне- і нізкатэмпературнымі радовішчамі медзі, свінцу, цынку, сурмы і ртуці. Седыментацыйная занальнасць узнікае ў сувязі з розныя геахім. рухомасцю металаў.

М.М.Давыдаў.

ЗАНА́ЛЬНАЯ РАСЛІ́ННАСЦЬ, прыродная расліннасць, якая характарызуе адпаведныя біёмы (тундра, тайга, стэп, пустыня і інш. прыродныя паясы і зоны). Займае найб. тыповыя мясціны: роўныя, узвышаныя, добра дрэнажаваныя водападзельныя плато (плакоры). У прыродных зонах з Пн на Пд у залежнасці ад складу і будовы расліннасці вылучаюць падзоны (напр., у стэпавай зоне — лугавых, сапраўдных і апустыненых стэпаў). Мяняецца і з З на У (напр., яловыя лясы Еўропы ў Сібіры замяшчаюцца лістоўнічнымі). Трапляецца і за межамі асн. зоны, на асабліва спрыяльных мясцінах, утварае экстразанальную расліннасць. Неаднароднасць рэльефу і звязаныя з гэтым змены глеб і ўмоў увільгатнення выклікаюць з'яўленне інтразанальнай расліннасці. Прыродная З.р. захавалася пераважна ў запаведніках (напр., тыповыя яловыя лясы Сярэднярускага ўзвышша ў Цэнтральналясным запаведніку, кавыльныя стэпы ў Асканіі-Нова, пустыні ў Рэпетэкскім запаведніку).

ЗА́НАРАЧ, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., на паўд. беразе воз. Нарач, на аўтадарозе пас. Нарач—в. Брусы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 28 км на ПдЗ ад г.п. Мядзел, 150 км ад Мінска, 47 км ад чыг. ст. Княгінін. 692 ж., 246 двароў (1997).

Вядома з 16 ст., мястэчка ў Ашмянскім пав. Віленскага ваяв. ВКЛ. З 1740 уласнасць Сташкевічаў, з 1781 — Даброўскіх. З 1795 у Рас. імперыі. У 1868 сяло Свянцянскага пав. Віленскай губ., 208 ж. У 1897 — 354 ж. З 1921 у складзе Польшчы, у Пастаўскім пав. Віленскага ваяв. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета Мядзельскага р-на. У Вял. Айч. вайну ў вер. 1942 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 41 чал. У 1971 — 379 ж., 140 двароў.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Царква. У цэнтры вёскі курганны могільнік (3-я чвэрць 1-га тыс. н.э.).

ЗАНГЕЗУ́РСКІ ХРЫБЕ́Т, горны хрыбет у Армянскім нагор'і, на мяжы Арменіі і Нахічэванскай аўтаномнай рэспублікі. Працягваецца мерыдыянальна ад верх. цячэння рэк Тэртэр і Арпа да р. Аракс. Даўж. каля 130 км. Выш. да 3904 м (г. Капутджух). Складзены пераважна з гранітаў і гранадыярытаў. На зах. схілах стэпавыя і паўпустынныя ландшафты, на ўсх. — часткова шыракалістыя лясы і субальпійскія лугі. Радовішчы медных руд.

ЗАНДЗІ́РАВАННЕ (ад франц. sonder выведваць, даследаваць) у медыцыне, метад даследавання і лячэння з дапамогай зондаў полых органаў, каналаў, свішчавых хадоў, гнойных поласцей і ран. Полымі зондамі праводзяць З. для апаражнення ці прамывання, узяцця змесціва (напр., страўнікавага соку), з мэтай даследавання, увядзення лек. прэпаратаў або рэнтгенакантрастных рэчываў, штучнага жыўлення хворых пасля аперацый, расшырэння звужанага прасвету. У хірургіі ўжываюць жолабападобныя зонды для праводкі рэжучага інструмента з мэтай аховы тканак ад пашкоджання.

ЗАНДЗІ́РАВАННЕ АТМАСФЕ́РЫ, даследаванне вертыкальнага (найб. пашырана) або гарызантальнага (эпізадычна) размеркавання т-ры, вільготнасці, ціску паветра, сонечнай радыяцыі і інш. параметраў *атмасферы*. Праводзіцца з дапамогай самалётаў, аэрастатаў, *радыёзондаў*, метэаралагічных ракет і *метэаралагічных спадарожнікаў*.

ЗАНДЗІ́РАВАННЕ ЗЯМЛІ́, вывучэнне наземных аб'ектаў на значнай адлегласці з паветра, космасу. Грунтуецца на выпрамяненні наземнымі аб'ектамі ўласнай энергіі або адлюстраванні сонечнага ці штучна накіраванага выпрамянення і іх рэгістрацыі апаратурай, якая бывае наземнай (у т.л. надводнай), паветранай, касмічнай. Размяшчаецца на самалётах, верталётах, аэрастатах, ракетах, штучных спадарожніках і інш. Аналіз спектральных характарыстык у розных дыяпазонах эл.-магн. выпрамянення дазваляе распазнаваць аб'екты і атрымаць інфармацыю пра іх памеры, шчыльнасць, хім. састаў, фіз. ўласцівасці і стан. Напр., для пошуку радыеактыўных руд і крыніц выкарыстоўваюць γ-дыяпазон, для вызначэння хім. саставу глеб і горных парод — ультрафіялетавую ч. спектра, для вывучэння глеб і расліннасці — светлавы дыяпазон, для ацэнкі т-р паверхні аб'ектаў — інфрачырвоны. Нясуць інфармацыю пра рэльеф паверхні, мінерал. састаў, вільготнасць, глыбінныя ўласцівасці прыродных утварэнняў і атм. слаі радыёхвалі. Гл. таксама *Зандзіраванне атмасферы, Аэрафотаздымка, Аэраэлектраразведка, Касмічная здымка.*

ЗА́НДРАРТ (Sandrart) Іаахім фон, Старэйшы (12.5.1606, г. Франкфурт-на-Майне, Германія — 14.10.1688), нямецкі гісторык мастацтва, жывапісец і графік. Вучыўся ў Нюрнбергу, Празе, Утрэхце, Лондане. Працаваў у Італіі

(1628—35), Нідэрландах (1637—44). Пісаў гістарычныя і жанравыя карціны, групавыя партрэты («Атрад стралкоў капітана Бікера») у духу *караваджызму*, наследаваў П.П.Рубенсу і А. ван Дэйку. У гал. мастацтвазнаўчай працы — трактаце «Нямецкая акадэмія» (т. 1—2, 1675—79; больш за 800 ілюстрацый) змешчаны каштоўныя звесткі пра мастакоў і музейныя калекцыі, пераклад «Метамарфоз» Авідзія.

ЗА́НДРЫ (ісланд. адз. л. sandr ад sand пясок), раўнінныя паверхні паблізу ўскраін стараж. і сучасных ледавікоў, складзеныя перамытым і пераадкладзеным матэрыялам *марэны* (пераважна пяском). Шырока развіты ў абласцях плейстацэнавага зледзянення. Утвараюцца пры зліцці краявых частак плоскіх конусаў вынасу падледавіковых патокаў. Незамацаваныя расліннасцю зандравыя пяскі нярэдка перавеяны ў дзюны. На тэр. Беларусі займаюць вял. плошчы на Палессі, у вярхоўях рэк Бярэзіна, Вілія і інш. У далінах горных ледавіковых рэк часта ўтвараюцца зандравыя тэрасы.

ЗАНЗІБА́Р (Zanzibar), востраў у Індыйскім ак., каля ўсх. ўзбярэжжа Афрыкі (аддзелены ад мацерыка пралівам шыр. 36 км). Уваходзіць у склад *Танзаніі*. Пл. 1658 км^2. Нас. каля 700 тыс. чал. (1995), пераважна суахілі (каля 80%), а таксама арабы і індыйцы. Выш. да 120 м, акаймаваны каралавымі рыфамі. Складзены з каралавых вапнякоў, развіты карст. Клімат экватарыяльна-мусонны. Сярэдняя т-ра студз. 28 °С, ліп. 23 °С. Ападкаў 1500—2000 мм за год з двума максімумамі (крас.—май, ліст.—снежань). Натуральная расліннасць — другасныя хмызнякі, на ўзбярэжжы месцамі мангры. Плантацыі гваздзіковага дрэва (каля 70—80% сусв. вытв-сці), какосавых пальмаў. Гал. горад і порт — Занзібар (158 тыс. ж., 1988).

Тэр. З. здаўна заселена чалавекам. У 7—10 ст. каланізаваны арабамі і персамі; цэнтр гандлю золатам, слановай косцю і рабамі. У 1528 захоплены партугальцамі, якіх у 18 ст. выцеснілі арабы Аманскага султаната. У 1818 пачалася вытв-сць гваздзікі і гваздзіковага алею — асн. прадуктаў экспарту. З 1856 З. — незалежны султанат. Яго эканам. развіццю садзейнічала буд-ва Суэцкага канала, у выніку чаго востраў ператварыўся ў важнейшы гандл. цэнтр усёй Усх. Афрыкі. У канцы 19 ст. З. стаў аб'ектам экспансіі Германіі, Італіі, Францыі і Англіі, якія ў 1886—90 падзялілі паміж сабой яго землі. У 1890 над З. устаноўлены брыт. пратэктарат. У 1963 Вялікабрытанія дала З. незалежнасць, перадала ўладу султану, рэжым якога скінуты ў 1964, і З. аб'яднаўся з Танганьікай у адзіную дзяржаву *Танзанія*.

ЗА́НІ, вёска ў Старагабскім с/с Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 10 км ад Мядзела, 173 км ад Мінска, 25 км ад чыг. ст. Княгініна. 173 ж., 64 двары (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ЗАНІВАЦКАЕ РАДО́ВІШЧА ПЯСЧА́НА-ЖВІРО́ВАГА МАТЭРЫЯ́ЛУ, у Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., за 3 км на ПдУ ад в. Заніавача. Паклад звязаны з канцова-марэннымі адкладамі паазерскага зледзянення. Пясчана-жвіровая парода шэрая, буравата-шэрая, месцамі слаба-гліністая, з праслоямі і лінзамі розназярністых пяскоў. Разведаныя запасы 6,2 млн. м^3, перспектыўныя 28,9 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,5—18 м, ускрышы (супескі, пяскі, торф) 0,2—5 м. Пяскі і жвір прыдатныя на выраб бетону, буд. растворaў, у дарожным буд-ве. *А.П.Шчураў.*

В.П.**Занковіч**.

ЗАНКО́ВІЧ Валянцін Паўлавіч (н. 5.6.1937, Мінск), бел. архітэктар і скульптар. Скончыў БПІ (1959), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1976). Працаваў у інце «Мінскпраект» (1960—70). Асн. работы: мемар. комплексы *Хатынь* (Ленінская прэмія 1970), *Брэсцкая крэпасць-герой*, *«Кацюша»*, помнікі М.Гастэлу і яго экіпажу каля г.п. Радашковічы, К.Заслонаву ў Оршы (абодва 1964), падпольшчыкам Асінторфа (1966) і інш. Аўтар помнікаў куляметнаму разліку (1975) перад уваходам у музей «Белавежская пушча» (Камянецкі р-н), падпольшчыкам в. Лошыца 2-я (цяпер у межах Мінска, 1980), дэкар. кампазіцыі «Бег» на стадыёне «Дынама» (1980), абеліска «Мінск — горад-герой» (1985) у Мінску, манум.-дэкар. кампазіцыі «Ручнікі» (1983) каля Палаца культуры ВА «Хімвалакно» ў Магілёве і інш. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1967.

ЗАНО́СНЫЯ РАСЛІ́НЫ, гл. *Адвентыўныя расліны*.

ЗАНУ́СІ (Zanussi) Кшыштаф (н. 17.6.1939, Варшава), польскі рэжысёр, сцэнарыст. Вучыўся ў Варшаўскім (1955—59) і Ягелонскім (у Кракаве 1959—62) ун-тах. Скончыў Вышэйшую школу т-ра, кіно і тэлебачання ў Лодзі (1966). Чл. Польскай АН (1994). Узначальвае Еўрап. федэрацыю кінарэжысёраў (з 1990). З 1977 выкладае ў Нац. кінашколе Вялікабрытаніі. Асн. праблематыка творчасці — маральная. Аналізуе ўплыў цывілізацыі і змен у грамадстве на духоўны стан чалавека («Смерць правінцыяла», 1966, «Структура крышталю», 1970, «За сцяной», 1971, «Імператыў», 1982), трываласць універсальных каштоўнасцей у сутыкненні з рэаліямі грамадскага жыцця («Ілюмінацыя», 1973, «Ахоўныя колеры», 1976, «Спіраль», 1978, «Кантракт», 1980, «Галоп», 1995); супрацьпастаўляе маральнай дэградацыі чалавека ўласныя гуманіст. погляды («З далёкага краю», 1981, «Год спакойнага сонца», 1984, «Жыццё за жыццё. Максімілян Кольбе», 1990, «Дотык рукі», 1992). Сцэнарыі З. выдадзены асобнымі кнігамі (1976, 1979, 1980, 1985, 1992). З 1979 займаецца тэатр. рэжысурай (супрацоўнічае з драм. т-рамі Кракава, Бона, Мілана, опернымі т-рамі Брэмена, Базеля, Палерма). Дзярж. прэмія Польшчы 1984. *Н.К.Мазоўка.*

ЗАНЬКАВЕ́ЦКАЯ (сапр. Адасоўская) Марыя Канстанцінаўна (4.8.1854, в. Занькі Чарнігаўскай вобл., Украіна — 4.10.1934), украінская актрыса і тэатр. дзеяч. Нар. артыстка Украіны (1923). З 1882 вядучая актрыса ўкр. труп М.Крапіўніцкага, М.Старыцкага, М.Садоўскага, П.Саксаганскага, І.Карпенкі-Карага і інш. У 1907 разам з Садоўскім арганізавала першы ўкр. т-р у Кіеве. Узначальвала Нар. т-р у Нежыне (1918), удзельнічала (разам з Саксаганскім) у стварэнні Нар. т-ра ў Кіеве (1918, цяпер Львоўскі ўкр. драм. т-р імя М.Занькавецкай). Сцэнічная творчасць адметная шчырасцю перажыванняў, майстэрствам унутранага і знешняга пераўвасаблення. Сярод лепшых роляў: Наталка, Цярпіліха («Наталка-Палтаўка» І.Катлярэўскага), Галя («Назар Стадоля» Т.Шаўчэнкі), Харыціна, Сафія («Наймічка», «Бесталанная» Карпенкі-Карага), Аза («Цыганка Аза» Старыцкага), Аксюша («Лес» А.Астроўскага) і інш.

М.К.**Занькавецкая**.

Літ.: Дурылін С.М. Марія Заньковецька. Київ, 1955.

ЗАНЬКО́ Фёдар Пятровіч (15.2.1921, в. Занькі Лепельскага р-на Віцебскай вобл. — 9.5.1979), поўны кавалер ордэна Славы. Скончыў школу паветр. стралкоў (1943). У Вял. Айч. вайну з

1941 на фронце. Паветраны стралок штурмавога авіяпалка старшына З. вызначыўся ў баях за вызваленне Крыма, Беларусі, ва Усх. Прусіі, зрабіў 234 баявыя вылеты.

ЗАНЯ́ТАСЦЬ НАСЕ́ЛЬНІЦТВА, удзел насельніцтва ў прац. дзейнасці. З.н. прынята лічыць грамадска карыснай дзейнасцю грамадзян, якая прыносіць, як правіла, заробак. Да занятых належаць тыя, хто працуе па найме, асобы, якія самастойна забяспечваюць сябе працай (прадпрымальнікі, фермеры), ваеннаслужачыя, а таксама тыя, хто вучыцца, служыць у арміі, вядзе хатнюю гаспадарку, даглядае дзяцей і састарэлых. Узровень З.н. залежыць ад суадносін паміж колькасцю працаздольнага насельніцтва і рабочых месцаў, а таксама наколькі рабочыя месцы могуць быць выкарыстаны работнікамі ў адпаведнасці з набытымі імі прафесіямі, спецыялізацыяй, прац. вопытам, ведамі і ўмельствам. Поўная З.н. азначае практычна поўнае забеспячэнне працаздольнага насельніцтва рабочымі месцамі. Частковая З.н. мае на ўвазе магчымасць уладкавацца на працу на няпоўны рабочы дзень. Няпоўная занятасць з'яўляецца крыніцай *беспрацоўя*.

У Рэспубліцы Беларусь права на працу гарантавана Канстытуцыяй. Адносіны, звязаныя з З.н., рэгулююцца заканадаўствам. Дзяржава садзейнічае беспрацоўным у пачатку або аднаўленні прац. дзейнасці і дае ім паводле заканадаўства пэўныя гарантыі і кампенсацыі, прадугледжаныя нормамі КЗаП і інш. прававымі актамі. Для рэалізацыі палітыкі З.н. ў краіне дзейнічае спец. дзярж. служба (гл. *Цэнтр занятасці*) і створаны Дзярж. фонд садзеяння занятасці з мэтай страхавання па беспрацоўі і фінансавання мерапрыемстваў у галіне занятасці. *Ю.Я.Савельеў.*

ЗАНЯ́ТЫ ПАПА́Р, гл. ў арт. *Папар.*

ЗА́ПАВЕДЗЬ, дзесяцісловье, дэкалог, прадпісанні, павучанні, у якіх выкладзены рэліг.-этычныя прынцыпы, што складаюць аснову *іудаізму* і *хрысціянства*. Выкладзены ў Пяцікніжжы (назва 5 кніг Старога запавету). Верагодна, да пісьмовай фіксацыі існавалі ў вуснай перадачы. Сфарміраваліся ў 1-й пал. 1-га тыс. да н.э. Падзяляюцца на З., якія абвяшчаюць *монатэізм* Яхве і забараняюць культ інш. багоў; З., якія змяшчаюць нормы маралі і правілы паводзін (прытрымліванне суботняга адпачынку, забарона забіваць, красці, квапіцца на чужое і інш.). Частка іх абумоўлена канкрэтна-гіст. зместам, таму іх нельга лічыць сукупнасцю норм абсалютнай маралі для ўсіх часоў і народаў. У Старым запавеце, напр., сустракаюцца наказы, што супярэчаць хрысціянскім З. (забарона забіваць супярэчыць норме «душа за душу, вока за вока»), старазапаветныя З. часам абвяргаюцца ў Новым запавеце.

ЗАПАВЕ́ДНА-ПАЛЯЎНІ́ЧАЯ ГАСПАДА́РКА, катэгорыя *запаведных тэрыторый*, у межах якіх актыўна праводзіцца работа па акліматызацыі, зберажэнні і аднаўленні запасаў дзічыны. У іх строга рэгулюецца паляванне (з навук. і спарт. мэтамі), абмежавана лясная гаспадарка, практыкуюцца біятэхн. мерапрыемствы (напр., клетачнае размнажэнне, прыручэнне жывёл). З.-п.г. — форма ахоўных тэр., характэрная толькі для б. СССР, дзе існавалі З.-п.г.: Завідаўская, Каўказская (Расія), Крымская, Азова-Сівашская (Украіна), Кургальджынская (Казахстан), Энгурэс (Латвія), *Белавежская пушча* з 1983 з філіялам Целяханская (Беларусь). *Э.Р.Самусенка.*

ЗАПАВЕ́ДНІКІ, 1) тэрыторыя сушы або акваторыя, у межах якой увесь прыродны комплекс поўнасцю выключаны з гасп. дзейнасці і ахоўваецца дзяржавай; від *запаведных тэрыторый*. Участкі зямлі, яе нетраў і воднай прасторы ў межах З. аддаюцца ў карыстанне грамадскім ці дзярж. органам. Асн. задачы З.: зберажэнне эталонных або найб. тыповых для вызначанай геагр. зоны прыродных ландшафтаў, рэдкіх і каштоўных відаў жывёл і раслін; вывучэнне прыродных працэсаў у натуральным стане; распрацоўка пытанняў рэканструкцыі флоры, фауны і комплексу інш. прыродаахоўных праблем; культ.-асв. работа, папулярызацыя прыродаахоўных поглядаў і аховы прыроды (гл. *Маніторынг, Біясферны запаведнік*). Вылучаюць З. накіраванага рэжыму, прыродныя, эталонныя, біясферныя, мемарыяльныя і інш. Для аховы прыродных комплексаў З. ствараюцца ахоўныя зоны. Ахоўвае З. спец. служба (дзяржінспектары, егеры). Навук. работа ў З. мае комплексны характар, вядуцца даследаванні па праграме «Летапіс прыроды».

Першыя дзярж. З. ўзніклі ў стараж. Вавілоне, Грэцыі, Індыі і ствараліся з рытуальнымі і паляўнічымі мэтамі. Найстаражытнейшы З. на слав. землях — *Белавежская пушча*. Першымі дзярж. З. Расіі былі *Баргузінскі запаведнік, Кедравая Падзь, Лагадэхскі запаведнік*, Саянскі (1915). Самы вял. З. у свеце — Вялікі Габійскі (Манголія, пл. 5 млн. га), у Расіі — *Таймырскі запаведнік*. Найб. вядомыя З. — *Асканія-Нова, Байкальскі запаведнік, Жувінтас, Каўказскі запаведнік, Кызылагаджскі запаведнік, Рэпетэкскі запаведнік* і інш.

На Беларусі два З.: *Бярэзінскі біясферны запаведнік* і *Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік* (адзіны ў свеце). Стварэнне, статут, структура і рэжым З. вызначаны Законам Рэспублікі Беларусь «Аб асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторыях і аб'ектах» (1994) і адпаведнай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13.3.1995. Вял. роля З. Беларусі ў зберажэнні і аднаўленні каштоўных і рэдкіх відаў жывёл (алень высакародны, бабёр, зубр, лось і інш.) і раслін, даследаванні па геабатаніцы, фларыстыцы, лесазнаўстве, фауністыцы, паляўніцтвазнаўстве, глебазнаўстве, экалогіі і інш. З. ўдзельнічаюць у міжнар. праграмах па ахове прыроды ў рамках МАБ, ЮНЕП, ЮНЕСКА. 2) Навукова-даследчыя ўстановы, за якімі замацаваны тэрыторыі, дзе вядуцца адпаведныя арганізацыйныя работы і даследаванні.

Літ.: Заповедники и национальные парки мира. М., 1969; Заповедники Белоруссии: Иссл. Вып. 1—6. Мн., 1977—82; Заповедники СССР: [Справ.]. М., 1980; Биосферный заповедник на Березине. Мн., 1993; Березинский биосферный заповедник. Мн., 1996.

Э.Р.Самусенка.

ЗАПАВЕ́ДНЫ РЭЖЫ́М, метад аховы прыродных тэрыторый, комплексаў і аб'ектаў шляхам поўнага ці абмежаванага неўмяшання людзей у прыродныя працэсы. Адрозніваюць абсалютна-запаведны (напр., у зонах абсалютнай запаведнасці ў запаведніках, нац. парках) або адносна-запаведны (напр., у зонах рэкрэацыйнага карыстання, кіроўных прыродных зонах нац. паркаў, заказніках) рэжым. Агульнае патрабаванне З.р. — недапушчальнасць атрымання эканам. выгады (выпас, касьба і інш.). Уводзіцца З.р. для захавання генафонду жывёл, раслін, дасягнення інш. мэт *аховы прыроды* на аснове падтрымання *экалагічнай раўнавагі*. На Беларусі З.р. ахоплены тэр. агульнай пл. каля 1,4 млн. га (*заказнікі, запаведнікі, нац. паркі, помнікі прыроды*).

ЗАПАВЕ́ДНЫЯ ЛЯСЫ́, лясныя масівы на тэрыторыі *асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і аб'ектаў* і каштоўныя ўчасткі лесу, абвешчаныя *помнікамі прыроды*, якія знаходзяцца пад аховай *запаведнага рэжыму*. З'яўляюцца эталонамі прыроды, прызначаны для захавання генет. фонду жывёл і раслін, натуральных раслінных згуртаванняў і экасістэм, выкарыстоўваюцца для вывучэння прыродных працэсаў у лясах. Частка З.л. (у запаведніках) абсалютна запаведныя, у іх выключаецца любое ўмяшанне ў прыродныя працэсы. На Беларусі агульная пл. З.л. каля 1200 тыс. га, у т.л. лясоў-запаведнікаў і нац. паркаў 240 тыс. га, ландшафтных, біялагічных і гідралагічных заказнікаў каля 800 тыс. га, каштоўных участкаў лесу 5,0 тыс. га. З.л. належаць да лясоў 1-й групы, у іх забаронена высечка і інш. лесагасп. дзейнасць.

ЗАПАВЕ́ДНЫЯ ТЭРЫТО́РЫІ, участкі зямлі або воднай прасторы, якія выключаны з гасп. дзейнасці чалавека; катэгорыя ўсіх або часткі *асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і аб'ектаў*. Размешчаныя ў межах З.т. прыродныя комплексы пэўнай навук. або культ. каштоўнасці маюць вял. значэнне для аховы і ўзнаўлення натуральных ландшафтаў, захавання генафонду жывёл і раслін. Асн. формы З.т.: *батанічны сад, заказнік, запаведна-паляўнічыя гаспадаркі, запаведнікі, помнікі прыроды, прыродныя нацыянальныя паркі, рэзерваты*.

Правобразам З.т. у старажытнасці былі свяшчэнныя рытуальныя гаі, крыніцы, прыватныя ці грамадскія паляўнічыя ўгоддзі (пушчы, бабровыя, ласіныя «гоны» і інш.). Адзін з першых запаведных лясных масіваў Еўропы — *Белавежская пушча*, першы нац. парк у свеце — *Ёелаўстонскі нацыянальны парк*. У многіх краінах свету існуюць 1—3 нац. паркі, шмат дзярж., грамадскіх і прыватных запа-

веднікаў, напр., у Нідэрландах 988, у Францыі каля 3 тыс. запаведнікаў і заказнікаў. Агульная пл. буйных З.т. у свеце 2,4 млн. км² (каля 1,6% сушы).

На Беларусі (на 1.9.1997) існуюць *Бярэзінскі біясферны запаведнік* і *Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік*, 3 нац. паркі — *Белавежская пушча*, Браслаўскі і Прыпяцкі і 85 заказнікаў агульнай пл. 1192,9 га. *Э.Р.Самусенка.*

ЗАПАВЕ́ТНЫЯ ГАДЫ́, у Рускай дзяржаве канца 16 ст. гады, у якія сялянам забаранялася пераходзіць ад аднаго феадала да другога ў Юр'еў дзень (асенні); этап запрыгоньвання сялян. Пачалі ўводзіцца з 1581 урадам Івана IV, замацаваны ўказам цара Фёдара Іванавіча каля 1592—93, які забараніў выхад сялян і аб'явіў пісцовыя кнігі апошняга агульнага апісання юрыд. асноў сял. прыгону.

ЗАПАВО́ЛЬВАННЕ НЕЙТРО́НАЎ, змяншэнне кінетычнай энергіі нейтронаў у выніку шматразовых сутыкненняў з атамамі асяроддзя. Прыводзіць да ўтварэння т.зв. цеплавых нейтронаў, якія могуць выклікаць *ланцуговую ядзерную рэакцыю*, напр. у прыродным уране.

У працэсе запавольвання частка нейтронаў губляецца: паглынаецца ядрамі атамаў ці вылятае за межы рабочага асяроддзя. У запавольніках (рэчывы, якія маюць лёгкія ядры і слаба захопліваюць нейтроны: вада, цяжкая вада, графіт, берылій і інш.) малыя страты нейтронаў і большая іх частка пераўтвараецца ў цеплавыя (механізм запавольвання залежыць ад энергіі нейтронаў). Гл. таксама *Ядзерны рэактар, Нейтронаграфія.*

ЗАПА́ДЗІНЫ, гл. *Стэпавыя сподкі.*

«ЗА́ПАДНАЯ КАММУ́НА», газета. Орган выканкома Саветаў Зах. вобласці (*Заходняй Камуны*). Выходзіла з ліст. 1918 да студз. 1919 у Смаленску на рус. мове. Працягвала традыцыі газ. «Известия исполнительных комитетов Советов рабочих, крестьянских и солдатских депутатов Западной Коммуны и города Смоленска». Інфармавала пра падзеі на франтах грамадз. вайны, становішча на акупіраванай тэр. Беларусі. Змяшчала афіц. ўрадавыя паведамленні, матэрыялы 6-й Паўн.-Зах. абл. канферэнцыі РКП(б), якая абвясціла стварэнне Беларускай ССР.

ЗАПАЗЫ́ЧАННІ ў мове, лексічныя, марфалагічныя, фанетычныя і інш. сродкі пэўнай мовы, што перайшлі з інш. моў у выніку моўнага ўзаемадзеяння. Абумоўлены сац.-эканам., дзярж.-паліт. і культ. зносінамі паміж народамі. Пранікаюць непасрэдна з моў-крыніц і праз пасрэдніцтва інш. моў вусным (размоўныя кантакты) і пісьмовым (кнігі, афіц. дакументы, перапіска) шляхам. Найб. актыўна праяўляюцца ў галіне слоўнікавага складу. Падпарадкоўваюцца законам фанетыкі, граматыкі, правілам словаўтварэння і семантычнай сістэмы мовы-рэцэптара. Паводле ступені асіміляцыі падзяляюцца на цалкам асвоеныя (словы, у фанетыка-марфал. афармленні і семантыцы якіх не застаецца нічога, што паказвала б на іх іншамоўнае паходжанне: бел. «блакітны», «булка», «дзірван», «салата», «школа» і інш.) і часткова асвоеныя (*экзатызмы*). Асобны разрад З. складаюць *варварызмы*, якія ў адрозненне ад экзатызмаў амаль заўсёды знаходзяцца па-за літ. мовай і не адлюстроўваюцца ў слоўніках.

У 14—18 ст. у бел. мову трапілі многія *паланізмы* («відэлец», «маёнтак») і пераважна праз польск. пасрэдніцтва — *германізмы* («дах», «ланцуг») і *лацінізмы* («градус», «апарат»). Ад старажытнасці бел. мове вядомы літуанізмы («клуня», «свіран»), *цюркізмы* («аркан», «торба»), *грэцызмы* («астраномія», «эпіграма»), чэшскія («праца», «мешчанін»), франц. («марш», «тарыф»), італьян. («канцэрт», «лютня») і інш. З. У наш час іншамоўная лексіка трапляе ў бел. ў асноўным праз рус. мову. Значную частку слоўнікавага складу бел. мовы ўтвараюць *інтэрнацыяналізмы*. У сваю чаргу бел. мова таксама паўплывала на суседнія: польскую (kryпіса — крыніца), літоўскую (kroupa — «крупы») і інш. У меншай ступені З. характэрны для граматыкі і фанетыкі. Асаблівая інтэнсіфікацыя З. назіраецца пры *двухмоўі*.

Літ.: Булыка А.М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV—XVIII стст. Мн., 1980. *А.М.Булыка.*



Запал гранаты: 1 — ударнік з баявой спружынай; 2 — спускавы рычаг; 3 — капсуль-запальнік; 4 — запавольнік; 5 — капсуль-дэтанатар.

ЗАПА́Л, 1) сродак для ўзбуджэння выбуху разрыўнога заряду інж. мін і ручных гранат. Складаецца з капсуля-запальніка і капсуля-дэтанатара, размешчаных у метал. (часам пластмасавай) гільзе. З. асколачных ручных гранат уключае таксама парахавы запавольнік і ўдарны механізм для ўзбуджэння гарэння капсуля-запальніка. 2) Прыстасаванне для ініцыявання выбуху выбуховага рэчыва з дапамогай эл. току (т.зв. мінны З., цяпер наз. *электрадэтанатарам*). 3) Адтуліна ў казённай частцы артыл. гарматы 15—17 ст., запоўненая порахам для запальвання кідальнага зарада.

ЗАПАЛЕ́ННЕ, мясцовая сасудзістатканкавая ахоўна-прыстасавальная рэакцыя арганізма на ўздзеянне патагенных раздражняльнікаў; адна з асн. прыкмет некаторых хвароб. Прычыны ўзнікнення З. бываюць экзагенныя (мех., фіз., хім. і біял.) і эндагенныя (тромбы, адклады солей, прадукты змярцвення і распаду тканак, інфаркты, гематомы і інш.). Прыкметы З. падзяляюцца на агульныя (павышэнне т-ры цела, пачашчэнне пульсу, змена саставу крыві, знясіленасць) і мясцовыя (пачырваненне, прыпухласць, боль, парушэнне функцый). У З. вылучаюць 3

стадыі: альтэрацыю, эксудацыю, праліферацыю. Альтэрацыя — парушэнне жыўлення клетак, дыстрафічныя, некратычныя і атрафічныя змены ў тканках; скажэнне абмену рэчываў, парушэнне фіз.-хім. якасцей тканак. Эксудацыя — расстройствы кровазвароту з выхадам вадкай ч. крыві і лейкацытаў з крывяносных сасудаў. Праліферацыя — размнажэнне клетачных элементаў на мяжы запалёнай і здаровай тканак. За праліферацыяй паступова развіваецца *рэгенерацыя*. Развіццё З. залежыць ад узросту, харчавання, абмену рэчываў, вынік — ад стану арганізма, формы З. і памераў яго ачага.

ЗАПАЛЁННЕ ЛЁГКІХ, пнеўманія, вострае і хранічнае запаленне бронхаў, альвеалярнай ці прамежкавай злучальнай тканак лёгкіх. Узнікненню З.л. садзейнічаюць пераахаладжэнне, ператамленні, шкодныя прывычкі, запаленчыя працэсы верхніх дыхальных шляхоў і інш.

Найчасцей бывае 3 формы вострага З.л.: крупознае, ачаговае, віруснае. Крупознае З.л. (долевае, фібрознае, плеўрапнеўманія) — запаленне долі лёгкага і плеўры з фіброзным выпатам у лёгачныя альвеолы. Пачынаецца раптоўна, т-ра цела павышаецца да 39—40 °С, слабасць, моцны боль у баку, кашаль з макротай іржавага колеру (ад дамешку крыві); цягнецца 2—3 тыдні. Ачаговае З.л. (бронхапнеўманія) — запаленне асобных участкаў лёгкіх без выпату. Пачынаецца паступова, слабы кашаль, макрота без крыві, т-ра 37—39 °С. Віруснае З.л. (інтэрстыцыяльнае) узнікае пры грыпе; хварэюць доўга. Ускладненні: плеўрыты, абсцэсы, калапс, хранічнае З.л. Лячэнне: тэрапеўтычнае, шпіталізацыя. *А.В.Лявонава.*

ЗАПАЛЁННЕ МАЧАВО́ГА ПУЗЫРЯ́, гл. *Цыстыт.*

ЗАПА́ЛКАВАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, галіна дрэваапрацоўчай прамысловасці, якая вырабляе *запалкі*. Адна з найб. механізаваных і аўтаматызаваных галін дрэваапр. прам-сці. Уключае апрацоўку драўніны (распілоўванне бярвення на цуркі і лушчэнне іх), выраб (са шпоны) і апрацоўку (парафінам) запалкавай саломкі, стварэнне запалкавай галоўкі, выраб запалкавых карабкоў (са шпоны або кардону), упакоўку запалак (па 50—60 шт. у 1 карабок), па 1000 карабкоў у скрынку. Вырабляецца паточным метадам.

Выраб запалак пачаўся ў многіх краінах у 1830-я г. Першая запалкавая ф-ка ў Расіі пабудавана ў Пецярбургу (1837). На Беларусі выраб запалак пачалі ў 2-й пал. 19 ст. У 1880 было 14 паўсаматужных ф-к. Выраблялі небяспечныя запалкі з прымессю белага фосфару (бяспечныя распрацаваны ў Швейцарыі ў 1855). У 2-й пал. 1920-х г. запалкі выраблялі ў гарадах Барысаў, Гомель, Рэчыца, Пінск. У Вял. Айч. вайну ф-кі разбураны. Пасля вайны працуюць Барысаўская і Пінская запалкавыя ф-кі, Гомельскі фанерна-запалкавы камбінат. Выпуск запалак складае 2029,1 тыс. умоўных скрынак (1996).

ЗАПА́ЛКІ, драўляныя палачкі (саломка) з галоўкамі з запальнай масы, якія выкарыстоўваюцца для здабывання агню. Па прызначэнні адрозніваюць запалкі бытавыя, падарункавыя і спецыяльныя. Бытавыя і падарункавыя падзяляюцца на бяспечныя (загараюцца ад спец. намазкі) і сесквісульфідныя (загараюцца ад любой паверхні, не вырабляюцца з прычыны самаўзгаральнасці). Спецыяльныя падзяляюцца на сігнальныя (рознакаляровае полымя), паляўнічыя, ветравыя, тэрмічныя, водаўстойлівыя, фатаграфічныя (замяняюць магній пры фатаграфаванні).

Асн. сыравіна для запалак — драўніна асіны, вольхі і інш. На галоўкі запалак ідуць (запальная маса): берталетава соль — 53%, шкло молатае — 13,3, клей касцявы — 12, сурык жалезны — 7, сера — 5,5, бялілы цынкавыя — 6, піралюзіт — 1,5, хромпік каліевы — 1,4, гумітрагант — 0,3%. Матэрыялы для намазкі карабка (фосфарная маса): фосфар чырвоны — 42%, антыманіт — 30, дэкстрын — 5, піралюзіт — 2, шкло молатае — 2, мел — 3%. Гл. таксама *Запалкавая вытворчасць.*

ЗАПАЛО́ССЕ, Запалоскае возера, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Вята, за 13 км на ПнЗ ад г. Міёры. Пл. 0,37 км², даўж. 1,1 км, найб. шыр. 440 м, найб. глыб. 6,9 м, даўж. берагавой лініі 3,8 км. Пл. вадазбору 13,1 км². Схілы катлавіны выш. 15—25 м, у верхняй ч. разараныя, на З парослыя лесам. Берагі высокія, абрывістыя, на ПнЗ зліваюцца са схіламі, на ПдУ і ў паўн. заліве сплавінныя, усюды пад хмызняком. Дно складанай будовы (упадзіны чаргуюцца з мелкаводнымі і астраўнымі падняццямі), уздоўж берагоў пясчанае, глыбей глеістае. З астравы агульнай пл. 2 га. Зарастае. Упадаюць 2 ручаі.

ЗАПА́ЛЬВАННЕ ў карбюратарных рухавіках, узгаранне гаручай сумесі ў цыліндрах у адпаведнасці з парадкам і рэжымам работы рухавіка. Адбываецца з дапамогай запальных свечак, паміж электродамі якіх пад уздзеяннем высокага напружання праскаквае эл. іскра. Выкарыстоўваецца ў аўтамабілях, матацыклах і інш.

З. ад эл. іскры дастаткова надзейнае, момант успышкі лёгка рэгулюецца. Для стварэння высокага напружання выкарыстоўваюць акумулятарныя батарэі разам з індукцыйнай шпуляй (найб. пашырана) або магнета. Батарэйнае З. забяспечвае надзейны пуск рухавіка, аднак абмяжоўвае яго быстраходнасць. Для павышэння эканамічнасці рухавіка павялічваюць ступень сціскання і абядняюць гаручую сумесь, што патрабуе павелічэння зазору паміж электродамі запальнай свечкі і, адпаведна, магутнасці іскравага разраду і суправаджаецца павышаным зносам кантактаў. Найб. дасканалыя кантактава-транзістарныя, бескантактава-транзістарныя і электронныя сістэмы З. забяспечваюць большую эканамічнасць, поўнае згаранне паліва і меншую таксічнасць выхлапных газаў. *А.С.Рукцяшэль.*

ЗАПА́ЛЬНАЯ ЗБРО́Я, баявыя сродкі для стварэння пажараў, паражэння жывой сілы і ваен. тэхнікі праціўніка. Засн. на выкарыстанні *запальных саставаў*. Уключае запальныя боепрыпасы і вогнесумесі, сродкі іх дастаўкі да цэлі. Выкарыстоўваецца з дапамогай авіяцыі (запальныя бакі, бомбы, касеты), артылерыі (запальныя снарады і міны), ручной зброі (запальныя гранаты, агнявыя фугасы, патроны, кулі, агнямёты). Ёсць таксама З.з., у якой спалучаецца запальнае дзеянне з інш. відамі паражэння (асколачна-запальныя снарады, бранябойна-запальныя снарады і кулі і інш.). З.з. выкарыстоўвалася ў 2-й сусв. вайне, у войнах у Карэі (1950—53) і В'етнаме (1964—73).

ЗАПА́ЛЬНЫЯ САСТА́ВЫ, *піратэхнічныя саставы*, а таксама гаручыя рэчывы ці іх сумесі, якія выкарыстоўваюць для начынення боепрыпасаў або агнямётаў. Пры гарэнні З.с. выдзяляецца бял. колькасць цяпла, якое перадаецца матэрыялу, што падпальваюць. Эфектыўнасць дзеяння залежыць ад саставу З.с. і ад канструкцыі боепрыпасаў.

Паводле хім. саставу падзяляюць на З.с. з акісляльнікамі — аксідамі марганцу і жалеза (гл. *Тэрміт*), нітратамі ці перхлоратамі металаў (напр., калію нітрат KNO_3, перхлорат $KClO_4$), іх шчыльнасць больш за 3000 кг/м³, цеплата згарання 6—8 МДж/кг, т-ра гарэння да 3000 °С; З.с., у якіх адсутнічае акісляльнік, згараюць у прысутнасці кісларoду паветра — загушчаныя нафтапрадукты (напр., *напалм*), белы фосфар, сплаў «электрон» (сплаў 96% магнію з алюмініем і інш. элементамі). Іх шчыльн. 800—2000 кг/м³, цеплата згарання 42 Мдж/кг, т-ра гарэння 800—1000 °С. *Р.А.Чарнушэвіч.*

ЗАПАЛЯ́РНАЕ ГАЗАКАНДЭНСА́ТНА-НАФТАВАЕ РАДО́ВІШЧА, размешчана на Пн Цюменскай вобл. Расіі, за 80 км на ПдЗ ад г.п. Тазаўскі (цэнтр здабычы). Уваходзіць у *Заходне-Сібірскую нафтагазавую правінцыю*. Адкрыта ў 1965. Паклад на глыб. 1—3 км. Пач. запасы 2631,5 млрд. м³.



Сістэма **запальвання** аўтамабіля: 1 — шпуля запальвання; 2 — першасная абмотка; 3 — другасная абмотка; 4 — размеркавальнік; 5 — перарывальнік; 6 — бегунок; 7 — свечка запальвання.

ЗАПАЛЯ́Р'Я АБАРО́НА (чэрв. 1941 — кастр. 1944), баявыя дзеянні войск Паўн., з 1.9.1941 Карэльскага франтоў, Паўн. флоту і Беламорскай флатыліі ў Вял. Айч. вайну на Кольскім п-ве, у паўн. Карэліі, на Баранцавым, Белым і Карскім морах супраць узбр. сіл гітлераўскай Германіі і саюзнай ёй Фінляндыі. Мэта — не дапусціць захопу праціўнікам Кольскага п-ва з незамярзаючым портам Мурманск і Кіраўскай чыгункай, забяспечыць абарону паўн. марскіх камунікацый. У выніку гераічнай абароны сав. войскі не дазволілі праціўніку ізаляваць СССР ад знешніх сувязей праз паўн. парты і перарэзаць Паўн. марскі шлях на Д. Усход, забяспечана дастаўка ў СССР праз Мурманскі порт ваенных грузаў марскімі канвоямі саюзнікаў. У кастр. 1944 узбр. сілы СССР выгналі захопнікаў з сав. Запаляр'я. Прэзідыум Вярх. Савета СССР заснаваў 5.12.1944 медаль «За абарону Савецкага Запаляр'я» (больш за 307 тыс. узнагароджаных). 7.5.1985 Мурманску прысвоена званне «Горад-герой».

ЗАПАМІНА́ЛЬНАЕ ПРЫСТАСАВА́ННЕ, сукупнасць тэхн. сродкаў для запісу, захоўвання і ўзнаўлення інфармацыі. Выкарыстоўваюцца ў выліч. тэхніцы, сувязі, аўтаматыцы, станках з лікава-праграмным кіраваннем, вымяральных прыладах і інш. Асн. параметры: ёмістасць (найб. колькасць *інфармацыі*, якую можна адначасова захоўваць), хуткадзеянне (характарызуе скорасць уводу-выводу інфармацыі і інш.) і энергаспажыванне.

Паводле функцыянальнага прызначэння адрозніваюць З.п. звышаператыўныя (ЗАЗП), аператыўныя (АЗП), пастаянныя (ПЗП, у т.л. перапраграмавальныя) і знешнія (ЗЗП); паводле характару звароту — адрасныя, бязадрасныя, асацыятыўныя (пошук і выбарка інфармацыі па пэўных прыкметах); паводле спосабу выбаркі інфармацыі — з паслядоўным (цыклічным) зваротам, з паралельным зваротам (адвольнай выбаркай). Запіс інфармацыі ў З.п. ажыццяўляецца пераўтварэннем яе ў эл., аптычныя, акустычныя ці інш. сігналы для змены стану, формы або цэласнасці пэўнага фіз. асяроддзя (гл. *Накапляльнік, Носьбіт інфармацыі*). ЗАЗП і АЗП прызначаны для захоўвання інфармацыі, неабходнай для аперацый, якія выконвае працэсар ЭВМ; у ПЗП захоўваюцца пастаянныя каэфіцыенты, даведачныя табліцы, падпраграмы, мікрапраграмы, знакагенератары і інш. ЗЗП і архіўная памяць прызначаны для захоўвання вял. масіваў інфармацыі для наступнай перадачы іх у АЗП; маюць накапляльнікі на *магнітных дысках*, барабанах, стужках, а таксама на магн.-аптычных і *аптычных дысках*. Гл. таксама *Памяць ЭВМ*.

М.П.Савік.

ЗАПА́РНІК-ЗМЯША́ЛЬНІК КАРМО́Ў, машына для прыгатавання кармавых сумесей здробненых с.-г. прадуктаў у сырым і запараным выглядзе, а таксама для змешвання сакавітых і грубых кармоў з канцэнтратамі, травяной мукой і інш. кармавымі дабаўкамі перад скормліваннем іх жывёле. Выкарыстоўваюцца З.-з.к. прадукцыйнасцю ад 2 да 5 т/гадз (з запарваннем) і да 10 т/гадз (без запарвання). Могуць працаваць як самастойныя машыны, так і ў тэхнал. лініях кармацэхаў. Запарнікі кармоў (бульбазапарачныя агрэгаты) прызначаныя для мыцця, запарвання, здрабнення і выгрузкі бульбы. Працуюць у цыклічным або бесперапынным рэжыме. Маюць запарачны чан умяшчальнасцю 3 м^3, мыйку, загрузачныя і выгрузачныя шнэкі, транспарцёр і інш. Прадукцыйнасць да 3 т/гадз.



Запарнік-змяшальнік кармоў С-2.



Да арт. **Запарнік-змяшальнік кармоў**. Схема бульбазапарачнага агрэгата: 1 — мыйка; 2 — гразевыгрузачны транспарцёр; 3 — загрузачны шнэк; 4 — запарачны чан; 5 — параразмеркавальнае прыстасаванне; 6 — выгрузны шнэк; 7 — мялка; 8 — шнэк для выгрузкі мязгі.

«ЗАПАРО́ЖАЦ», марка легкавых аўтамабіляў асабліва малога класа Запарожскага аўтамаб. з-да (Украіна). Характэрная асаблівасць — задняе размяшчэнне рухавіка. Гл. ў арт. *ЗАЗ*.

ЗАПАРО́ЖАЦ Аляксандр Аляксандравіч (н. 13.2.1927, г. Растоў-на-Доне, Расія), бел. вучоны ў галіне паталаг. фізіялогіі. Д-р мед. н. (1985), праф. (1994). Ганаровы акад. Міжнар. акадэміі інтэграцыйнай антрапалогіі (1996, Кіеў). У 1957—94 у Ін-це фізіялогіі АН Беларусі. Навук. працы па даследаванні інфекц. працэсу і прафілактыцы ўскладненняў пасля аперацый на органах страўнікава-кішачнага тракту. Адкрыў з'яву інфіцыравання брушной поласці з кішэчніка праз фізічна герметычны шоў. Даў новыя ўяўленні пра механізмы ўзнікнення перытаніту і спаечнага працэсу пасля аперацый на страўніку і кішэчніку. Дзярж. прэмія Беларусі 1988.

Тв.: Инфицирование брюшины через физически герметичный кишечный шов. Мн., 1968; Послеоперационный перитонит. Мн., 1974.

ЗАПАРО́ЖЖА, горад на Украіне, цэнтр Запарожскай вобл., порт на р. Дняпро. Засн. ў 1770. 895 тыс. ж. (1994). Чыг. вузел. Аэрапорт. Прам-сць: чорная і каляровая металургія (камбінаты «Запарожсталь», тытана-магніевы; з-ды «Днепраспецсталь», ферасплаваў, алюм., электродны і інш.), маш.-буд. і металаапр. (ВА «АўтаЗАЗ», з-ды высакавольтнай апаратуры, «Запарожкабель», інстр., суднарамонтна-суднабуд. і інш.); хім. і коксахім.; лёгкая (у т.л.

Запарожжа.

абутковая, швейная), харчасмакавая, мікрабіял.; вытв-сць будматэрыялаў (абразіўны камбінат). Дняпроўская ГЭС. 4 ВНУ (у т.л. ун-т). 3 тэатры, філармонія. Краязнаўчы і маст. музеі.

ЗАПАРО́ЖСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ПдУ Украіны. Утворана 10.1.1939. Пл. 27,2 тыс. км^2. Нас. 2078 тыс. чал., гарадскога 76% (1996). Цэнтр — г. *Запарожжа*. Найб. гарады: Мелітопаль, Бярдзянск, Арэхаў, Прыморск.

П р ы р о д а. Большая ч. тэр. вобласці раўнінная, на ПдУ Прыазоўскае ўзв. з ізаляванымі ўзгоркамі (выш. да 324 м, г. Магіла-Бельмак), на Пд Прычарнаморская нізіна, якая абмываецца Азоўскім м. Карысныя выкапні: жал. і марганцавыя руды, буры вугаль, граніт, каалін, графіт. Мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя

т-ра студз. -4 °С, ліп. 22—24 °С. Гадавая колькасць ападкаў 350—450 мм. Гал. рака — Дняпро з прытокам Конка; да бас. Азоўскага м. належаць рэкі: Малочная, Абіточная, Берда, Кахоўскае вадасх. На ўзбярэжжы Азоўскага м. шэраг ліманаў і салёных азёр. Глебы чарназёмныя, цёмна-каштанавыя, каштанавыя і саланцы. Стэпы разараныя, участкі драўнінна-хмызняковай раслінасці ўздоўж рэк. Філіял Укр. стэпавага запаведніка («Каменныя Магілы»).

Г а с п а д а р к а. З.в. — развіты прамысл. раён. Асн. галіны прам-сці: чорная (чыгун, сталь, пракат) і каляровая (вытв-сць алюмінію, тытану, магнію) металургія, маш.-буд. і металаапрацоўка (сілавыя трансфарматары, высакавольтная электраапаратура, кабель, электраприборы, легкавыя аўтамабілі, рухавікі, с.-г. машыны і агрэгаты), коксахім., хім. і нафтахім. (паліэмеры, сінт. смолы, тэхн. масла, шкловалакно, лакі і інш.). Лёгкая (трыкатажная, швейная, абутковая), харчасмакавая (маслабойна-тлушчавая, мукамольная, мясная, малочная, рыбная, кансервавая), камбікормавая прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Здабыча жал. руды (Белазерскі жалезарудны раён). Днепрагэс, Запарожская ДРЭС, Запарожская АЭС. С.-г. ўгоддзі займаюць 2210 тыс. га, у т.л. пад ворывам 1893 тыс. га (1996). Пасевы збожжавых (пшаніца, кукуруза, ячмень), кармавых, тэхнічных (сланечнік, соя, клешчавіна) культур. Вырошчваюць агародніну, бахчавыя. Пладаводства і вінаградарства. Мяса-малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля, авечка- і птушкагадоўля. Шаўкаводства. Рыбалоўства. Значныя масівы арашальных зямель. Суднаходства па р. Дняпро. Марскі порт — г. Бярдзянск. Па тэр. вобласці праходзяць чыгункі Масква—Сімферопаль, Запарожжа—Валнаваха, Запарожжа—Бярдзянск, аўтадарогі Масква—Сімферопаль, Запарожжа—Марыупаль, Запарожжа—Днепрапятроўск. Курорты: Бярдзянск, Кірылаўка.

В.М.Сасноўскі.

ЗАПАРО́ЖСКАЯ СЕЧ, ваенна-палітычная арг-цыя ўкр. *казакоў*, казацкая рэспубліка ў 16—18 ст. за Дняпроўскімі парогамі. Назва ад драўляных умацаванняў — «сечаў», якія рабілі казакі. Засн. збеглымі прыгоннымі сялянамі, у т.л. з Беларусі, і гар. беднякамі. Вышэйшы орган — Вайск. рада, якая выбірала старшыну (кіраўніцтва) на чале з кашавым атаманам. Падзялялася на курані (у 1770-я г. іх было 38). Вяла барацьбу з польска-ўкр. землеўладальнікамі, крымскімі татарамі і туркамі. З паўстання ў З.с. пад кіраўніцтвам Б.*Хмяльніцкага* пачалася *вызваленчая вайна ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*. У 1709 за ўдзел запарожцаў у *Булавінскім паўстанні 1707—08* і дапамогу шведам у час *Паўночнай вайны 1700—21* З.с. ліквідавана рас. ўладамі. У 1734 створана т.зв. Новая сеч, якая ўдзельнічала ў рус.-тур. войнах 1735—39 і 1768—74. Канчаткова ліквідавана 5.8.1775 пры Кацярыне II як небяспечны асяродак нар. хваляванняў. Частка казакоў збегла да туркаў і заснавала *Задунайскую сеч*. З другой часткі ў 1787 утворана Чарнаморскае казацкае войска.

ЗАПАСНЫ́Я ВО́ЙСКІ, злучэнні, часці і падраздзяленні ўзброеных сіл (родаў войск, спец. войск), якія фарміруюцца перад пачаткам і ў ходзе вайны для папаўнення дзеючай арміі і флоту. Арганізац. структура З.в. вызначаецца неабходнасцю ўзнаўлення страт ваеннаслужачых адпаведных спецыяльнасцей.

У склад З.в. могуць уваходзіць запасныя дывізіі, палкі і інш., а таксама базы і вучэбныя цэнтры. У З.в. праводзіцца ваен. падрыхтоўка (перападрыхтоўка) ваеннаслужачых, укамплектаванне і баявое зладжванне падраздзяленняў і часцей. Ва Узбр. Сілах Беларусі аснову З.в. складае асобны від ваен. фарміраванняў (базы захоўвання ваен. тэхнікі і ўзбраення, базы рэзерву авіяц. тэхнікі і інш.). Гл. таксама *Рэзервовыя войскі*, *Рэзервы* (ваен.).

І.Р.Дзянісенка.

ЗАПА́СЫ ВЫТВО́РЧЫЯ, матэрыяльныя рэсурсы, прылады працы для забеспячэння непарыўнасці вытв. працэсу. Па характары прызначэння З.в. падзяляюць на бягучыя, страхавыя, падрыхтоўчыя (тэхналагічныя) і сезонныя. Б я г у ч ы запас ствараецца на перыяд паміж 2 пастаўкамі рэсурсаў. С т р а х а в ы запас патрэбен на выпадак перабою ў забеспячэнні, яго памер абумоўлены велічынёй бягучага запасу, месцам знаходжання пастаўшчыкоў, метадамі транспарціроўкі і інш. П а д р ы х т о ў ч ы запас ствараюць на час, які патрэбен для прыёмкі, праверкі якасці, падрыхтоўкі да вытв-сці (выкарыстання) і дастаўкі на рабочыя месцы. С е з о н н ы запас вызначаецца па рэсурсах. Гл. таксама *Запасы таварныя*.

У.Р.Залатагораў.

ЗАПА́СЫ КАРЫ́СНЫХ ВЫ́КАПНЯЎ, колькасць мінеральнай сыравіны ў нетрах Зямлі ці на яе паверхні, вызначаная геал. разведкай або ў працэсе распрацоўкі радовішчаў. Па кожнаму віду *карысных выкапняў* падлічваюцца асобна для радовішчаў, рудных палёў, раёнаў, басейнаў, краін, кантынентаў і Зямлі. На комплексных радовішчах падлічваюць запасы асноўнага карыснага выкапня і таго, які залягае разам з ім, а таксама спадарожныя кампаненты, прамысл. выкарыстанне якіх мэтазгодна. Вымяраюць у адзінках аб'ёму ці масы, падзяляюць на балансавыя, распрацоўка якіх эканамічна мэтазгодная, і пазабалансавыя. Паводле ступені вывучанасці З.к.в. адрозніваюць р а з в е д а н ы я, якія служаць асновай праектавання і буд-ва гарнарудных прадпрыемстваў; п а п я р э д н е а ц э н е н ы я, якія з'яўляюцца рэзервам радовішча, і п р а г н о з н ы я (геалагічныя), якія паказваюць перспектывы выяўлення прамысл. запасаў і вызначаюць мэтазгоднасць арганізацыі геолагаразведачных і пошукавых работ.

На Беларусі (на 1.1.1996) выяўлена і разведана каля 5 тыс. радовішчаў мінер. сыравіны, якія змяшчаюць каля 30 розных відаў карысных выкапняў. Магчымыя для здабычы запасы нафты вызначаны ў 338,3 млн. т; прагнозныя запасы бурага вугалю ўсіх геал. узростаў (неагенавы, юрскі, каменнавугальны) — 1350,8 млн. т; запасы торфу — 5,7 млрд. т; з іх даступныя для распрацоўкі — 558 млн. т; прагнозныя запасы гаручых сланцаў — 11 млрд. т; запасы калійных солей — больш за 6,4 млрд. т; кухоннай солі — каля 22 млрд. т; сапрапеляў — больш за 3 млрд. т; даламітаў — 768 млн. т (па Рубаўскім радовішчы даламітаў). Агульныя прамысл. запасы сыравіны для вытв-сці цэменту (мел, даламіт) складаюць 940,9 млн. т; вапны (мел) — 136,9 млн. т, буд. і аблiцовачнага каменю — 588,1 млн. м^3, кварцавых шкловых пяскоў — 15,2 млн. т, буд. і сілікатных пяскоў — 434,6 млн. м^3, фармовачных пяскоў — 43 млн. т, пясчана-жвіровых матэрыялаў — 688,2 млн. м^3, глін для вырабу цэглы — 251,6 млн. м^3, тугаплаўкіх глін — 53,2 млн. м^3, гліністай сыравіны для вытв-сці аглапарыту і керамзіту — 81,3 млн. м^3. Прагнозныя запасы жал. руд Аколаўскага радовішча ацэньваюцца па ўдакладненых звестках у 500 млн. т, Навасёлкаўскага — 76,3 млн. т. Па

стану на 1.1.1993 запасы фасфарытаў Сожскага басейна складаюць 30 млн. т, Прыпяцкага басейна — 52,9 млн. т. Прагнозныя запасы гіпсу складаюць 1026,9 млн. т, кааліну — 26,9 млн. т, пірафіліту — 4500 млн. м^3, цэалітазмяшчальных трэпелаў — 214,4 млн. т (радовішчы Дружба і Стальное). Запасы глаўканітавых пяскоў у раёне г. Лоеў ацэньваюцца ў 15—18 млн. т. *У.Я.Бардон.*

ЗАПА́СЫ ТАВА́РНЫЯ, рэзервы гатовай да рэалізацыі (спажывання) прадукцыі, якая знаходзіцца ў сферы абарачэння, а таксама ў адпаведных запасах, што ствараюцца для бесперапыннага функцыянавання нар. гаспадаркі і насельніцтва на выпадак надзвычайных абставін (аварый, стыхійных бедстваў). Іх мэтай з'яўляецца своечасовасць і бесперапыннасць забеспячэння спажыўцоў (пакупнікоў) вызначаным відам прадукцыі і задавальненне спажывецкага попыту, выкананне дагаворных абавязкаў. З.т. ствараюцца ў аптовых і рознічных установах гандлю, у вытворца і спажыўца. Запасы сыравіны, матэрыялаў, топліва, некаторых відаў машын і абсталявання, харчовых і інш. тавараў, прызначаных на выпадак надзвычайных абставін, часта называюць *дзяржаўнымі рэзервамі*. З.т. не павінны быць залішнімі, бо пры гэтым павялічваюцца *выдаткі вытворчасці* і абарачэння. Гл. таксама *Запасы вытворчыя*. *У.Р.Залатагораў.*

ЗАПАТО́ЦКІ (Zápotocký) Антанін (19.12.1884, в. Закалані, каля г. Кладна, Чэхія — 13.11.1957), дзяржаўны і паліт. дзеяч Чэхаславакіі. Сын Л.Запатоцкага — аднаго з заснавальнікаў с.-д. партыі Чэхіі. З 1902 чл. с.-д. партыі. Дэлегат 2, 4, 6 і 7-га кангрэсаў Камінтэрна. Адзін з заснавальнікаў кампартыі Чэхаславакіі (КПЧ), чл. яе ЦК і Палітбюро з дня заснавання (1921). У 1922—25 сакратар ЦК КПЧ, у 1925—38 дэп. Нац. сходу, у 1929—39 ген. сакратар Цэнтр. бюро прафсаюзаў. У 1939—45 у фаш. турмах і канцлагерах. У 1948—53 старшыня Савета Міністраў, у 1953—57 прэзідэнт Чэхаславакіі.

ЗАПАТЫ́ЛЬНЫ СТАНО́К, металарэзны такарны станок для апрацоўкі задняй паверхні (запатылка) зубцоў рэзальнага інструменту (фрэз, метчыкаў, раскрутак), прафілявання кулачкоў. Бываюць універсальныя (могуць выкарыстоўвацца і як такарна-вінтарэзныя станкі агульнага прызначэння) і спецыяльныя. Жорсткая канструкцыя станіны, супарта, апор З.с. забяспечваюць высокую дакладнасць апрацоўкі пры ўдарных нагрузках. Запатыльванне можна рабіць і на разьбашліфавальных станках.

ЗАПАЎНЯ́ЛЬНІКІ для бетонаў і растворaў, прыродныя або штучныя сыпкія матэрыялы, якія ў сумесі з *вяжучымі рэчывамі* і вадой (часам без яе) утвараюць *бетоны* і *будаўнічыя растворы*. Складаюць да 85% іх аб'ёму, дазваляюць рэгуляваць іх уласцівасці.

Падзяляюцца на дробныя з памерам зерняў да 5 мм (пераважна *пясок*) і буйныя 5—70 мм (*жвір*, *друз*); цяжкія, або шчыльныя (прыродныя, пераважна кварцавыя, і драблёныя пяскі, а таксама жвір і друз з розных парод, металург. шлакаў і інш. матэрыялаў) і лёгкія, або порыстыя (штучныя — *аглапарыт*, *керамзіт*, успучаныя *вермікуліт* і *перліт*, шлакавая пемза, паліўныя *шлакі* і *попел*; прыродныя — драблёныя порыстыя горныя пароды: *пемза*, *туф*, *ракушачнік* і інш.). Выкарыстоўваюць таксама арган. З.: пілавінне, драўняную стружку, трэскі, драблёны чарот, успучаныя палімерныя гранулы. *І.І.Леановіч.*

ЗАПА́ШНЫЯ, сям'я расійскіх цыркавых артыстаў. Выступаюць у жанрах акрабатыкі і гімнастыкі. Вальтэр Міхайлавіч (н. 2.4.1928), акрабат, гімнаст, дрэсіроўшчык. Засл. арт. Расіі (1969). Стварыў атракцыён «Сярод драпежнікаў» (1961). Мсціслаў (Мечыслаў) Міхайлавіч (н. 16.5.1938). Засл. арт. Расіі (1971). Нар. арт. СССР (1990). Выступае з сястрой Ганнай і жонкай Далорэс у нумарах, якія спалучаюць акрабатыку і вальтыжыроўку, а таксама як дрэсіроўшчык слановў і тыграў. Нумар «Акрабаты-вальтыжоры браты Запашныя» вылучаецца кампазіцыйнай дакладнасцю, насычанасцю трукамі, акцёрскай выразнасцю.

Атракцыён «Слоны і тыгры» Д. і М.Запашных.

ЗАПІС 533

цып работы якой заснаваны на вылучэнні пэўнай групы падзей (з'яўленне эл. імпульсаў, іанізавальных часціц ці інш.) пры ўмове, што хоць адна з іх адбываецца не адначасова з астатнімі. Мае некалькі ўваходаў і адзін выхад; выхадны сігнал выдаецца толькі пры адсутнасці сігналу на адным з уваходаў; напр., пры даследаваннях паглынальных здольнасцей рэчыва да забаранялных уваходаў З.с. далучаюцца лічыльнікі, размешчаныя пасля даследаванага слоя, да астатніх уваходаў — размешчаныя паміж крыніцай выпрамянення і дадзеным слоем. Выхадны сігнал мае інфармацыю толькі аб часціцах, паглынутых у выпрабаваным слоі рэчыва. Выкарыстоўваецца ў ядз. электроніцы, амплітудных аналізатарах, дэшыфратарах, дэкадавальных прыладах і інш.

А.В.Берастаў.

ЗА́ПІС ТЭЛЕВІЗІ́ЙНЫХ СІГНА́ЛАЎ, запіс відарысаў (напр., тэлепраграм) з мэтай іх захоўвання і наступнага ўзнаўлення. Бывае аналагавы і лічбавы (найб. дасканалы). У адрозненне ад фота- і кіназдымкі пры З.т.с. відарыс напачатку пераўтвараецца ў паслядоўнасць эл. сігналаў (*відэасігналаў*), якія фіксуюцца на носьбіце запісу. Адрозніваюць магн. (найб. пашыраны), аптычны, магн.-аптычны, эл.-статычны, мех. З.т.с.; пры запісе ў памяць ЭВМ выкарыстоўваюцца накапляльнікі даных.

Магн. З.т.с. падобны на *магнітны запіс* гуку і ажыццяўляецца на магн. стужцы (або дыску) з дапамогай *відэамагнітафона*. Адроз-

ніваецца магчымасцю шматразовага выкарыстання носьбіта, дазваляе электронны мантаж фрагментаў відэаінфармацыі і інш. Пры аптычным і магн.-аптычным З.т.с. на носьбіт запісу ўздзейнічае светлавы прамень (звычайна лазерны), у выніку чаго асобныя ўчасткі носьбіта мяняюць свае аптычныя характарыстыкі (напр., каэф. адбіцця, пераламлення ці паглынання святла; гл. *Аптычны дыск*). Пры эл.-статычным З.т.с. на *сігналаграме* фіксуецца размеркаванне эл. зарадаў (патэнцыяльны рэльеф) на паверхні носьбіта (дыска). Дыскі выкарыстоўваюцца толькі для ўзнаўлення інфармацыі (як грампласцінкі) з дапамогай ёмістаснага пераўтваральніка. Мех. З.т.с. падобны на мех. *гуказапіс*; яго носьбіт — метал. ці пластмасавы дыск, на паверхні якога сігналаграма фіксуецца ў выглядзе спіральнай канаўкі, шырыня (ці глыбіня) якой мяняецца ў адпаведнасці з параметрамі відэасігналаў.

А.П.Ткачэнка.

«ЗАПІСКІ АДДЗЕЛА ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК», серыйнае навуковае выданне. Выдавалася ў 1927—30 у Мінску на бел. мове Інбелкультам і БелАН. У серыю ўваходзілі «Працы...» камісій, кафедраў, ін-таў Інбелкульта (кн. 1—6) і БелАН (кн. 7—13). Змяшчаліся матэрыялы па гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, мастацтвазнаўстве, філалогіі і правазнаўстве, справаздачы аб экспедыцыях, дзейнасці навук. устаноў, рэцэнзіі і бібліягр. агляды. Пераважная ўвага аддавалася публікацыям даследаванняў і крыніц па гісторыі і культуры Беларусі (асабліва перыяду феадалізму), бел. мове (працы А.Бурдзейкі, Я.Гембіцкага, Дз.І.Даўгялы, М.В.Доўнар-Запольскага, В.Д.Дружыца, С.А.Дубінскага, Т.Забелы, У.Ігнатоўскага, А.Дз.Кавалені, К.Кернажыцкага, У.Краснянскага, М.Любаўскага, А.М.Ляўданскага, В.Мачульскага, К.М.Палікарповіча, У.Пічэты, Ц.Сцяпанава, С.С.Шутава, М.М.Шчакаціхіна, А.Ясінскага). Выданне ілюстравалася малюнкамі, фатаграфіямі, картамі, схемамі, планамі; змяшчала геагр. паказальнікі.

А.Л.Кіштымаў.

«ЗАПІСКИ СЕВЕРО-ЗАПАДНОГО ОТДЕЛА РУССКОГО ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА», часопіс, орган Паўн.-Зах. аддзела рускага геагр. т-ва. Выдаваўся ў 1910—14 у Вільні на рус. мове. Выйшлі кн. 1—4. Рэдактар Дз.І.Даўгяла. Асвятляў дзейнасць аддзела, публікаваў матэрыялы па этнаграфіі, фальклоры, геалогіі, археалогіі, гісторыі, геаграфіі і інш., змяшчаў рэцэнзіі і агляды л-ры. На старонках часопіса публікаваліся М.Я.Нікіфароўскі («Напаўпрыказкі і напаўпрымаўкі, якія ўжываюцца ў Віцебскай Беларусі», кн. 1—4), В.В.Іваноў («Сялянскае вяселле ў Віцебскай Беларусі», кн. 3), І.А.Сербаў («Па Дрыгавіцкай вобласці летам 1911 г.» і «Паездка па Палессі летам 1912 г.», кн. 3—4), М.Я.Белацаркавец [«Жніўныя песні ў Барысаўскім павеце (Мінскай губерні)», кн. 3], Б.Сцепанец [Ф.А.Кудрынскі («Сялянскае вяселле ў Паўднёвым Палессі», кн. 1)], Даўгяла («Да гісторыі Паўночна-Заходняга аддзела», кн. 1—2), Е.Р.Раманаў («Старажытныя рускія прыказкі», «Па Гродзенскім Палессі», «Альбом мастака Д.М.Струкава як вынік экспедыцыі па Паўночна-Заходнім краі ў 1864 г.», кн. 1—3), С.Ф.Дабранскі («Масонскія ложы ў Літве», і «Нарысы з гісторыі масонства ў Літве», кн. 2, 4) і інш.

Г.А.Пятроўская.

ЗАПІСНО́Е, г р а ш о в а е, феадальная грашовая павіннасць сялян ВКЛ у 16—18 ст. Спаганялася пры ўнясенні *чыншу*. Звычайна складала 1 грош з кожнага злотага чыншу (адсюль другая назва). Была пашырана на ўсёй тэр. Беларусі.

«ЗА́ПІСЫ», навуковы часопіс бел. эміграцыі. Выдаецца з 1952 на бел. мове (кн. 1—22; у 1952—54 і з 1974 у Нью-Йорку; у 1962—70 у Мюнхене, Германія) *Беларускім інстытутам навукі і мастацтва* ў Нью-Йорку. Гал. рэдактары В.Тумаш, С.Станкевіч, Т.Бэрд. Мае раздзелы: «Даследаванні», «Рэфератныя працы», «Нарысы», «Успаміны», «Дакументы», «Зацемкі», «Бібліяграфія», «Хроніка беларускага жыцця ў беларускім замежжы», «Кнігапіс». Друкуе працы па бел. гісторыі, мове, л-ры, мастацтве, эканоміцы, матэрыялы пра дзеячаў гісторыі і культуры Беларусі, рэцэнзіі на беларусазнаўчыя выданні, хроніку бел. навук.-культ. жыцця на эміграцыі. За час існавання «З.» сталі цэнтрам гуртавання інтэлектуальных сіл зах. бел. дыяспары.

А.С.Ляднёва.

ЗАПО́Й, перыядычныя прыступы шматдзённага п'янства з прычыны неадольнай цягі да алкаголю. Від З., узнікненне якога звязваюць з глыбокім парушэннем настрою (дэпрэсія, дысфарыя), наз. д ы п с а м а н і я й. У прамежку паміж З. алкаголь не ўжываюць (сапраўдны З.) ці ўжываюць параўнальна памяркоўна (З. пры хранічным *алкагалізме*).

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 22 км на ПнЗ ад г. Орша, 102 км ад Віцебска, 1 км ад чыг. ст. Смальяны. 220 ж., 73 двары (1997). Базавая школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 22 км на ПдЗ ад г. Бялынічы, 66 км ад Магілёва, 20 км ад чыг. ст. Друць. 433 ж., 157 двароў (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, дом быта, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Каля вёскі стараж. селішча і курганны могільнік.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Віцебскім р-не, на правым беразе р. Усвяча. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 51 км на ПнУ ад горада і 55 км ад чыг. ст. Віцебск. 292 ж., 85 двароў (1997). Лясніцтва. Сярэдняя школа, б-ка, бальніца, ветлячэбніца, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Помнік *Віцебскія «вароты»*.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Дабрыца. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 11 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Рагачоў, 132 км ад Гомеля. 622 ж., 216 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. 2 брацкія магілы сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Мінск—Слуцк. Цэнтр Бокшыцкага с/с і калгаса. За 6 км на Пн ад горада і чыг. ст. Слуцк, 99 км ад Мінска, 175 ж., 78 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, насыпаны курган і пастаўлена стэла.

ЗАПО́ЛЛЕ, радовішча глін у Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., каля в. Заполле. Пласты паклад звязаны з азёрна-ледавіковымі адкладамі паазерскага зледзянення. Гліны чырванавата-бурыя, карычневыя, шчыльныя, пластычныя з праслойкамі пяску, супеску і суглінку. Разведаныя запасы 18,6 млн. м^3, перспектыўныя 23,6 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 2,7—10,9 м, ускрышы (пяскі, супескі) 0,2—4,7 м. Гліны прыдатныя на выраб цэглы.

А.П.Шчураў.

ЗАПО́ЛЬСКАЕ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ. Дзейнічала ў жн. 1941 — ліп. 1944 у в. Заполле Ружанскага р-на (цяпер Пружанскі р-н) Брэсцкай вобл. пад кіраўніцтвам Ружанскіх антыфаш. к-та і падп. райкома ЛКСМБ (з жн. 1943). У 1942 налічвала 16 чал. Сакратары: Я.І.Гардзей (да чэрв. 1943), У.І.Прадко (да жн. 1943), І.М.Маньчык (да ліп. 1944). Падпольшчыкі здабывалі зброю і боепрыпасы для партызан, распаўсюджвалі лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, праводзілі дыверсіі, са здабытых шрыфтоў у 1942 абсталявалі друкарню. У в. Заполле ў гонар падпольшчыкаў пастаўлены абеліск.

ЗАПО́ЛЬСКАЯ [Zapolska; сапр. К о р в і н - П і я т р о ў с к а я (Korwin-Piotrowska)] Габрыэля (30.3.1857, в. Падгайцы Луцкага р-на Валынскай вобл., Украіна — 17.12.1921), польская пісьменніца і актрыса. Выступала ў т-рах Варшавы, Львова, Парыжа. Пачала друкавацца ў 1880-я г. У прозе глыбокі псіхалагізм характараў спалучала з натуралістычнымі тэндэнцыямі (зб. навел «Акварэлі», 1885, «Чалавечы звярынец», 1893, аповесць «Сезонная любоў», 1905). Найб. вядомасць ёй прынеслі драм. творы (п'есы «Жабуся», 1897, «Іх чацвёра», 1907, «Паненка Малічэўская», 1910), асабліва п'еса «Мараль пані Дульскай» (1906, пер. на бел. мову М.Татур, 1958, паст. т-рам імя Я.Коласа ў 1956) — вострая, з'едлівая сатыра на мяшчанства. Аўтар п'ес «Той» (1898), «Сібір» (1899), рамана «Зашуміць лес» (1899).

ЗАПО́ЛЬСКІ, біялагічны заказнік на тэр. Віцебскага р-на. Створаны ў 1979 як заказнік-журавінік рэсп. значэння для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Пл. 794 га (1997). Размешчаны на вярховым балоце са значнымі мінер. ўчасткамі. У складзе балотнай расліннасці хваёва-кусцікавасфагнавыя фітацэнозы з вял. пашырэннем журавін, хвойнікі асаковыя, асакова-сфагнавыя, багуновыя і інш. На мінер. участках пераважаюць яловыя, бярозавыя і асінавыя лясы чарнічнага і кіслічнага тыпаў.

ЗАПРУ́ДНІК Янка (сапр. Вільчыцкі Сяргей Мікалаевіч; н. 9.8.1926, г.п. Мір Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. гісторык, палітолаг, паэт, літ.-знавец, публіцыст. Д-р гіст. н. (1969). З 1944 у эміграцыі. Вучыўся ў бел. гімназіі імя Я.Купалы ў Міхельсдорфе (Германія). Скончыў Лувенскі ун-т (Бельгія, 1954). У 1947 дэбютаваў вершамі (пад псеўд. Сяргей Ясень). З 1948 працаваў шахцёрам у Англіі, браў удзел у выданні час. «Наперад» (1948—53), дзе друкаваліся і яго творы. У 1954—91 супрацоўнік бел. рэдакцыі радыё «Свабода» (у 1970—75 адначасова выкладаў гісторыю ў Куінсі-каледжы гарадскога ун-та Нью-Йорка). Публікаваўся і ўваходзіў у склад рэдкалегіі час. «Беларуская моладзь» (1959—64), рэдагаваў бюлетэнь «Навіны з Беларусі» (1964—69), быў гал. рэдактарам газ. «Беларус» (1970—80, з 1980 папераменна з З.Кіпель). У 1969 абараніў доктарскую дысертацыю «Палітычная барацьба за Беларусь у царскай Дзяржаўнай Думе. 1906—1917». Аўтар кн. «Спадчына бацькоў: «Агледзіны»: (Да 100-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы і Я.Коласа)» (Нью-Йорк, 1982). Яго манаграфія «Беларусь на гістарычных скрыжаваннях» (1993, на англ. мове) знаёміць заходняга чытача з шматвяковай гісторыяй і сучасным станам Беларусі.

Тв.: Бел. пер. — Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мн., 1996.

ЗАПРУ́ДСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 14—17 ст. каля в. Запруды Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Яго абарончымі ўмацаваннямі былі земляныя валы з вастраколам наверсе і вадзяныя равы. У плане валы і равы нагадваюць упісаныя адзін у адзін прамавугольнікі, якія з У мелі бакі ў выглядзе паўдуг, што сыходзіліся ў месцы ўезду ў замак. У замку размяшчалася сядзіба феадала. Захаваліся валы выш. 1,5—2 м і шыр. у аснове да 4 м. Равы маюць глыбіню да 2,5 м і шыр. каля 5 м.

ЗАРА́, сукупнасць маляўнічых светлавых з'яў у атмасферы перад усходам Сонца (ранішняя) або пры яго захадзе (вячэрняя). Інтэнсіўнасць афарбоўкі залежыць ад наяўнасці ў паветры пылу, вільгаці. З. абумоўлена складаным спалучэннем працэсаў паглынання, рассеяння, дыфракцыі і пераламлення сонечных прамянёў у атмасферы. Колер З. з'яўляецца мясц. прыкметай надвор'я.

ЗАРА́ АЛАТА́У, зімовы сорт яблыні казахскай селекцыі. Атрыманы з сеянцаў сорту Ранет арлеанскі ад свабоднага апылення. На Беларусі вырошчваюць у гаспадарках Гродзенскай вобл. і садаводы-аматары.

Дрэва сярэднярослае, з шырокаавальнай кронай, пладаносіць на 5—6-ы год пасля пасадкі (на клонавых прышчэпах — на 2—3-і год). Плады сярэдняй велічыні (100—115 г) шырокаканічныя, светла-жоўтыя, з лёгкім аранжавым румянцам, дэсертнага прызначэння. Выспяваюць у пачатку кастр., захоўваюцца да крас.— мая. Мякаць шчыльная, дробназярністая, сакаўная, духмяная. Сорт сярэднеўстойлівы да паршы, зімаўстойлівы, ураджайны.

Зара Алатау.

ЗАРААСТРЫ́ЗМ, рэлігія, якая была пашырана ў старажытнасці і раннім сярэдневякоўі ў Іране, Афганістане, Сярэдняй Азіі, Азербайджане, краінах Б. і Сярэдняга Усходу; захавалася ў парсаў Індыі і гебраў у Іране. Назва ад імя прарока *Заратуштры* (Зараастра). Свяшчэнны канон З. — *«Авеста»*. Асн. прынцыпы: вера ў адзінага бога *Ахурамазда*; процістаўленне 2 спрадвечных пачаткаў — дабра і зла, барацьба паміж якімі складае змест сусв. працэсу; вера ў канчатковую перамогу дабра; шанаванне агню; забарона закапвання памерлых у зямлю. Ідэйныя канцэпцыі З. мелі ўплыў на фарміраванне *манiхейства, мітраізму, іудаізму,* хрысц. ерасей паўлікіян і катараў.

ЗАРАБО́ТНАЙ ПЛА́ТЫ ЖАЛЕ́ЗНЫ ЗАКО́Н, канцэпцыя, паводле якой сярэдняя зарплата вызначаецца велічынёй затрат, што забяспечваюць існаванне і аднаўленне рабочай сілы. Закон сфармуляваны Ф.*Ласалем*. У яго аснову пакладзена канцэпцыя выдаткаў вытв-сці, што складаюцца з працы і капіталу; якія фарміруюць цану прадукту. Прац. выдаткі павінны ўключаць затраты на харчаванне, вопратку, падтрыманне працаздольнасці. Зарплата вагаецца вакол гэтай сумы, бо калі яна будзе, напр., вышэй, то гэта прывядзе да паляпшэння дабрабыту, росту колькасці насельніцтва, павелічэння прапаноў рабочай сілы, што ў сваю чаргу знізіць зарплату. Калі ж зарплата зменшыцца, то пагоршыцца дабрабыт, упадзе нараджальнасць, знізіцца прапанова рабочай сілы, што прывядзе да росту аплаты працы.

ЗАРАБО́ТНАЯ ПЛА́ТА, частка *нацыянальнага даходу*, якая паступае ў індывід. спажыванне тых, хто працуе па найму. Адрозніваюць намінальную З.п. (сума грашовых сродкаў, атрыманых работнікам за выкананне работы на працягу пэўнага перыяду часу) і рэальную З.п. (тая колькасць тавараў і паслуг, якую можна за яе набыць). У залежнасці ад спецыфікі працы прымяняюць пагадзінную [аплата праводзіцца па тарыфных стаўках (акладах) адпаведна колькасці працы] і здзельную сістэму З.п. (аплата па фактычнай выпрацоўцы прадукцыі па здзельных расцэнках). У большасці краін мінімум З.п. ўстанаўліваецца законам.

Паводле працоўнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь З.п. — гэта сукупнасць узнагароджанняў у грашовай або (і) натуральнай форме, якія атрымлівае работнік за фактычна выкананую работу, а таксама за перыяды, што ўключаюцца ў рабочы час. Мінім. З.п. з'яўляецца асновай для вызначэння памераў рэсп. тарыфаў *аплаты працы*, пенсій, стыпендый, дапамог і інш. сац. выплат. У *калектыўных дагаворах*, пагадненнях можа быць прадугледжаны больш высокі памер мінім. З.п. Максімальны памер З.п. не абмяжоўваецца. Рэсп. тарыфамі аплаты працы з'яўляюцца месячныя тарыфныя стаўкі і службовыя аклады, якія вызначаюць узроўні аплаты працы для канкрэтных прафесійна-кваліфікацыйных груп работнікаў бюджэтных устаноў і арг-цый, а таксама наймальнікаў, якія карыстаюцца дзярж. датацыямі. Інш. наймальнікі, калі гэта прадугледжана калект. дагаворамі ці пагадненнямі, абавязаны выкарыстоўваць рэсп. тарыфы для дыферэнцыяцыі аплаты працы работнікаў. Рэсп. тарыфы аплаты працы вызначаюцца ўрадам або інш. упаўнаважаным органам з удзелам прафсаюзаў. Аплата працы ажыццяўляецца, як правіла, на аснове тарыфных ставак (службовых акладаў), якія вызначаюцца ў калект. дагаворы або наймальнікам. На цяжкіх работах, работах са шкоднымі ўмовамі працы і работах у мясцовасцях з цяжкімі кліматычнымі ўмовамі ўстанаўліваецца павышаная аплата працы.

Формы, сістэмы і памеры аплаты працы работнікаў устанаўліваюцца наймальнікам на аснове калект. дагавора, пагадненняў і *працоўнага дагавора*; работнікаў дзярж. бюджэтных устаноў — у парадку, які вызначаецца ўрадам; у вышэйшых дзярж. органах — устанаўліваюцца законам. Наймальнік у лік атрыманага ім прыбытку можа ўстанаўліваць работнікам узнагароджанне па выніках гадавой работы. Памер узнагароджання вызначаецца з улікам вынікаў працы работніка і працягласці беспарапыннага стажу работы ў дадзенага наймальніка. Работнікі маюць права на частку прыбытку прадпрыемства ў выпадках, прадугледжаных заканад. актамі

або статутам прадпрыемства. З.п. падлягае *індэксацыі* ў адпаведнасці з заканадаўствам. Для забеспячэння выплат належнай работнікам З.п., гарантыйных і кампенсацыйных выплат наймальнікі абавязаны ствараць рэзервовы фонд З.п. *Ю.Я.Савельеў.*

ЗАРА́Д, пэўная колькасць *выбуховага рэчыва*, цвёрдага ракетнага паліва; ядзернага рэчыва, аснашчанага сродкамі запальвання або ўзбуджэння дэтанацыі (*запаламі*, *дэтанатарамі* і інш.).

Ваен. З. бываюць: выкідальныя (парахавыя ў неразбуральным корпусе запальных, касетных, асвятляльных і інш. боепрыпасаў); кідальныя (парахавыя ў гільзах, патронах, трубах для выстрэльвання снарадаў, бомбаў, мін, гранат, куль, тарпед); падрыўныя (вадкія, пастападобныя, цвёрдыя, эластычныя для падрыву аб'ектаў на зямлі, у грунце, вадзе і паветры); разрыўныя (*брызантныя выбуховыя рэчывы* ў корпусах бомбаў, мін, тарпед і інш. разрыўных боепрыпасаў); ракетныя цвердапаліўныя (блокі цвёрдага ракетнага паліва ў камерах ракетных рухавікоў глыбінных бомбаў, рэактыўна-ўсплываючых мін, тарпед); шнуравыя (падоўжаныя падрыўныя ў гнуткай або многасекцыйнай абалонцы, укладваюцца на дно вадаёма); ядзерныя (гл. *Ядзерная зброя*). У прам-сці выкарыстоўваюцца З. загадзя разлічанага па масе выбуховага рэчыва, размешчанага ў шпурах, свідравінах і інш. горных выпрацоўках. Бываюць сканцэнтраваныя (сферычныя, кубічныя і блізкія да іх) і падоўжаныя (цыліндрычныя, плоскія).



Размяшчэнне **зарадаў** выбуховага рэчыва ў горных выпрацоўках: *а* — шчылінінага; *б* — катлавога; *в* — камернага; 1 — выбуховае рэчыва; 2 — паветраны прамежак; 3 — забойка.

ЗАРА́Д ЭЛЕКТРЫ́ЧНЫ, крыніца электрамагнітнага поля, звязаная з матэрыяльным носьбітам; унутраная характарыстыка элементарнай часціцы, якая вызначае яе *электрамагнітнае ўзаемадзеянне*. З.э. любога зараджанага цела — цэлы лік, кратны *зараду элементарнаму*. Поўны З.э. замкнутай сістэмы захоўваецца пры любых узаемадзеяннях (гл. *Заряду захавання закон*). Адрозніваюць З.э.: дадатны (напр., зарад наэлектрызаванага шкла) і адмоўны (зарад наэлектрызаванага бурштыну). Сіла ўзаемадзеяння паміж зараджанымі целамі (часціцамі), якія знаходзяцца ў спакоі, падпарадкоўваецца *Кулона закону*. Узаемасувязь паміж З.э. і эл.-магн. полем вызначаецца *Максвела ўраўненнямі*. *А.У.Астапенка.*

ЗАРА́Д ЭЛЕМЕНТА́РНЫ, найменшы *зарад электрычны* (дадатны ці адмоўны), роўны па абс. значэнні зараду электрона. Абазначаецца *e* і роўны $1{,}60211733(49)\times\times10^{-19}$ Кл (упершыню вымераны Р.*Мілікенам* у 1911). Усе элементарныя часціцы маюць зарад 0 (напр., нейтроны), *+e* (пратоны, пазітроны) або *-e* (электроны, антыпратоны); выключэнне — некаторыя рэзанансы, зарад якіх кратны *e*. Часціцы з дробавымі З.э. не назіраліся, аднак у тэорыі моцных узаемадзеянняў (гл. *Квантавая хромадынаміка*) мяркуецца існаванне часціц з зарадам, кратным $(1/3)e$ (гл. *Кваркі*). *А.У.Астапенка.*

ЗАРА́ДАВАЕ СПАЛУЧЭ́ННЕ, аперацыя замены ўсіх элементарных часціц, што ўдзельнічаюць у якім-н. узаемадзеянні, на адпаведныя ім *антычасціцы*. Доследным шляхам устаноўлена, што гравітацыйныя, эл.-магн. і моцныя ўзаемадзеянні пры З.с. не мяняюцца. Для кожнага працэсу, які адбываецца з пэўнымі часціцамі, існуе такі ж працэс для іх антычасціц. Наяўнасць сіметрыі адносна З.с. ў гэтых узаемадзеяннях прывяло да ўвядзення *зарадавай цотнасці*. Пры слабых узаемадзеяннях сіметрыя адносна З.с. адсутнічае, што вынікае з незахавання пры гэтым прасторавай *цотнасці*. Гл. таксама *Людэрса—Паўлі тэарэма*.

ЗАРА́ДАВАЯ ЦО́ТНАСЦЬ, С-цотнасць, *квантавы лік* сапраўды нейтральнай элементарнай часціцы (сістэмы часціц), які вызначае паводзіны яе хвалевай функцыі пры *зарадавым спалучэнні*. У працэсах, абумоўленых гравітацыйнымі, эл.-магн. або моцнымі ўзаемадзеяннямі, З.ц. захоўваецца (не мяняецца).

Пры зарадавым спалучэнні *хвалевая функцыя* сапраўды нейтральнай часціцы не мяняецца (дадатная З.ц.) або мяняе знак (адмоўная З.ц.). Для фатона З.ц. адмоўная: С=-1, гэта вынікае з таго, што пры зарадавым спалучэнні эл. зарады, а значыць, і эл.-магн. палі, квантамі якіх з'яўляюцца фатоны, мяняюць знак. Для π^0– і η^0– мезонаў, якія распадаюцца на 2 γ-кванты, С = 1. Сапраўды нейтральнай сістэмай з'яўляецца *пазітроній* (звязаны стан электрона і пазітрона), для якога $C = (-1)^{J+1}$, дзе J — поўны спін сістэмы, 1 — арбітальны момант іх адноснага руху. Гэтай формулай вызначаецца таксама З.ц. сапраўды нейтральных мезонаў, пабудаваных з *кварка* і адпаведнага антыкварка.

Літ.: Окунь Л.Б. Лептоны и кварки. 2 изд. М., 1990. *А.У.Астапенка.*

«ЗАРА́ДНА» («Zaradna», з 1941 «Беларус»), рачная кананерская лодка *Пінскай ваеннай флатыліі*, якая ўдзельнічала ў абарончых баях на Беларусі і Паўн. Украіне ў пач. Вял. Айч. вайны. Пабудавана ў 1933—35 у Пінску, уваходзіла ў склад Пінскай флатыліі ВМФ Польшчы. Затоплена экіпажам 19.9.1939 у час паходу Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь. Паднята сав. маракамі і пасля капітальнага рамонту (да 21.2.1941) перайменавана ў «Беларус», уключана ў Пінскую ваен. флатылію. Мела на ўзбраенні 2 гарматы і кулямёт, экіпаж каля 15 чал. У чэрв. — вер. 1941 вяла баі з перадавымі часцямі вермахта ў Дняпроўска-Бугскім канале, на Прыпяці, Дзясне (участак Асцёр—Жукін у Чарнігаўскай вобл.) і Дняпры (Кіеўскі напрамак). Далейшы лёс карабля невядомы. *Р.К.Паўловіч.*

Рачная кананерская лодка **«Зарадна»**.

ЗАРА́ДУ ЗАХАВА́ННЯ ЗАКО́Н, адзін з асн. законаў прыроды, паводле якога алгебраічная сума *зарадаў электрычных* замкнутай (эл. ізаляванай) сістэмы застаецца нязменнай пры любых працэсах унутры гэтай сістэмы. Устаноўлены ў 18 ст.

Адкрыццё *электрона* ў канцы 19 ст. і *пратона* ў пач. 20 ст. даказала, што эл. зарад звязаны з часціцамі (з'яўляецца іх унутранай уласцівасцю) і ёсць цэлы лік, кратны *зараду элементарнаму*. З.з.з. — вынік захавання колькасці часціц у тых працэсах, дзе няма іх узаемаператварэнняў. Напр., пры электрызацыі макраскапічных цел зараджанья часціцы пераносяцца з аднаго цела на другое. У фізіцы элементарных часціц, для якой характэрна ўзаемаператварэнне часціц, нараджэнне «новай» часціцы суправаджаецца знікненнем «старой» з такім жа зарадам або нараджэннем яшчэ адной часціцы з зарадам процілеглага знака (напр., працэс *нараджэння пары* часціца—антычасціца). *А.У.Астапенка.*

ЗАРАЖА́НКА, назва р. *Галбіца* ў верхнім і сярэднім цячэнні.

ЗАРАЗІ́ХА, ваўчок (Orobanche), род кветкавых раслін сям. заразіхавых. Больш за 150 відаў. Пашыраны ў субтрапічным і ўмераным паясах Паўн. паўшар'я. На Беларусі пераважна ў паўд. раёнах трапляюцца 9 відаў: З. галінастая (O. ramosa), белая (O. alba), эльзаская (O. alsatica), гваздзіковая (O. caryophyllacea), блакітнаватая (O. coerulescens), парэзнікавая (O. libanotidis), кумская, або сланечнікавая (O. cumana), высокая (O. elatior), бледнакветкавая (O. pallidiflora).

Адна-, двух- і шматгадовыя бесхларафільныя травяністыя расліны. Сцёблы тоўстыя, мясістыя, простыя або галінастыя, каля асновы звычайна клубне- ці булавападобнатоўшчаныя, з прысоскамі (*гаўстарыямі*) — відазменены карані, якімі З. прысмоктваецца да каранёў раслін, на якіх яна паразітуе. Лісце чаргаванае або супраціўнае, лускападобнае. Кветкі з трубчастым, двухгубым вяночкам рознага колеру, сабраны ў колаасці гронкападобныя суквецці. Плод — 2—3-створкавая шматнасенная каробачка. Лек. і харч. расліны, некат. віды (напр., З. галінастая) — пустазелле. *Г.У.Вынаеў.*

ЗАРА́ЗНЫЯ ХВАРО́БЫ, гл. *Інфекцыйныя хваробы.*

ЗАРА́ЙСК, горад у Расіі, раённы цэнтр у Маскоўскай вобл., на р. Асётр. Вядомы з 13 ст., горад з 1778. 27,1 тыс. ж. (1992). Чыг. станцыя. Прам-сць: металаапр., лёгкая і харч.; вытв-сць будматэрыялаў. Музеі гіст.-маст. і скульптара Г.С.Галубкінай. Крэмль (1531) з Нікольскім саборам (1681) і царквой Іаана Прадцечы (1821), Благавешчанская (пач. 19 ст.), Троіцкая (1788), Ільінская (1835) цэрквы, гандл. рады 19 ст.

ЗАРА́КА-ЗАРАКО́ЎСКІ Баляслаў Францавіч (30.3.1894, г. Полацк Віцебскай вобл. — 2.12.1963), генерал-лейтэнант (1946). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1935). У арміі з 1913, у Чырв. Арміі з 1918. У 1932—41 нач. кафедры Ваенна-інж. акадэміі, дацэнт Маскоўскага гідрамеліярац. ін-та. У Вял. Айч. вайну на Зах. і 1-м Бел. франтах, камандзір палка, дывізіі, нам. нач. штаба 1-га Бел. фронту. У 1944—48 на адказных пасадах у Войску Польскім.

«ЗАРА́НЕ», тайнае таварыства ў 1821 — пач. 1826 у Беластоцкай і Свіслацкай гімназіях. Заснаваў Ф.*Ляховіч* спачатку ў Беластоку (наз. «Згодныя браты», 1821), потым у Свіслачы. Выступалі за незалежнасць Рэчы Паспалітай, падрыхтоўку грамадскай думкі да пераўтварэнняў у існуючым ладзе. У пач. 1826 у таварыстве 53 чал. Пяць былых сяброў т-ва склалі 3-ю ступень т-ва «*Ваенныя сябры*». Некаторыя мелі дачыненне да *Літоўскага піянернага батальёна выступлення 1825.* У сувязі са следствам па гэтай справе «З.» былі выкрыты, створана спец. «Камісія для пошуку тайных таварыстваў» (ліп. — вер. 1826). Удзельнікі «З.» былі прыгавораны да розных тэрмінаў пакарання. *В.В.Швед.*

Заразіха блакітнаватая.

ЗАРА́НКА; малінаўка (Erithacus rubecula), птушка сям. раздовых атр. вераб'інападобных. Пашырана ў Еўропе, Паўн.-Зах. Афрыцы, М. Азіі, цэнтр. абласцях Зах. Сібіры, на Каўказе. Жыве ў мяшаных і хвойных лясах, садах і парках. На Беларусі звычайны пералётны від.

Даўж. цела 14—16 см, маса 16—20 г. Апярэнне мяккае, рыхлае. У дарослых спіна, крылы і хвост аліўкава-шэрыя, брушка белае, лоб, шчокі, гарляк, грудзі цагляна-рыжыя. Маладыя птушкі зверху цёмна-бурыя з вохрыстымі стракацінамі, бруха жаўтавата-вохрыстае з цёмнымі крапінамі. Гнёзды будуе з сухога лісця, травы, поўсці і інш. ў шчылінах ствалоў, на зямлі. Нясе 6—7 яец двойчы за год. Корміцца пераважна насякомымі. Зімуе на Пд да Егіпта, у Зах. Еўропе, М. Азіі, на З да Пакістана.

Заранка: 1 — дарослая, 2 — птушаня.

«ЗАРА́НКА», бел. выдавецтва ў эміграцыі. Засн. ў 1946 Я.Гладкім у г. Ватэнштэт (Германія). Выпусціла «лемантар» (1946), падручнік геаграфіі (1947), чытанкі «Родны палетак» і «Малюнкі мінулага» (1947), «Наша краіна» і «Помнікі старажытнасці» (1948), зборнікі нар. песень і казак. Пасля пераезду Гладкага ў ЗША аднавіла дзейнасць на пач. 1960-х г. у Нью-Йорку. Выйшла больш за 10 кніжак і брашур, у т.л. «Лемантар для школаў і хатняга навучання» (1964), «Для малых дзетак» (1965), зб-к нар. песень «Дудар» (2-е выд. 1970); А.Варлыгі (псеўданім Гладкага) «Прыказкі Лагойшчыны» (1966), «Краёвы слоўнік Лагойшчыны» (1970), «Забабоны Лагойшчыны» (1972) і інш. Спыніла дзейнасць у 1972 у сувязі са смерцю Гладкага. *А.С.Ляднёва.*

«ЗАРА́НКА», дзіцячы ілюстраваны часопіс. Выдаваўся ў 1927—31 у Вільні на бел. мове. Выходзіў нерэгулярна. Рэдактар-выдавец Зоська *Верас* (Л.А.Войцік). Створаны з выхаваўчай і асветнай мэтай, спрыяў узгадаванню маладых літ. сіл у Зах. Беларусі. Друкаваліся пісьменнікі старэйшага пакалення М.Машара, Г.Леўчык, Я.Пачопка, Л.Войцік, У.Паўлюкоўскі, маладыя зах.-бел. пісьменнікі С.Крывец, С.Новік-Пяюн, пачаткоўцы А.Арэхва, М.Тарасюк, Я.Патаповіч і інш. Перадрукоўваў творы Я.Коласа, М.Багдановіча, З.Бядулі, К.Буйло і інш., змяшчаў пераклады твораў рус., польск., укр. пісьменнікаў. Публікаваў казкі, легенды, паданні (рубрыка «Працы нашых чытачоў»), гумарыст. творы (рубрыка «Куток смеху»). Меў таксама рубрыку «Загадкі і круцігалоўкі». Выйшла 15 нумароў (асобныя здвоеныя).

Літ.: Войцікава Л. (Зоська Верас). [Заранка] // Полымя. 1968. № 4. *А.С.Ліс.*

ЗАРА́НКА Сяргей Канстанцінавіч (6.10.1818, в. Ляды Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. — 1.1.1871), расійскі жывапісец, педагог. Вучыўся ў А.*Венецыянава* (пачатак 1830-х г.) і ў Пецярбургскай АМ (1834); з 1843 акадэмік, з 1850 праф. З 1856 праф. Маск. вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства.

С.**Заранка**. Партрэт княгіні Трубяцкой.

Майстар партрэта: партрэты А.Венецыянава (2-я пал. 1830-х г.), спевака В.Пятрова (1840), скульптара Ф.Талстога (1850), княгіні Трубяцкой, групавы партрэт «Выгляд залы вучылішча пражнаўства з групамі настаўнікаў і выхаванцаў» (1841). Пісаў інтэр'еры («Унутраны від Марскога Нікольскага сабора, 1843, і інш.). У творах дакладнасць і матэрыяльнасць пісьма, характэрныя для венецыянаўскай школы, паступова змянялася ілюзіяністычным натуралізмам (партрэты Н.Сакуравай, 1854, П.Панамарова, 1855). Распрацаваў сістэму выкладання, пабудаваную пераважна на вывучэнні натуры, дакладнасці ў перадачы бачнага свету. Садзейнічаў развіццю бел. мастацтва, аказваў дапамогу маладым мастакам (В.Сляндзінскаму і інш.). Сярод вучняў В.*Пяроў*, В.*Пукіраў*, У.*Макоўскі*, К.*Макоўскі*.

ЗАРАНО́К Таццяна Піліпаўна (н. 25.12.1917, г. Васілевічы Гомельскай вобл.), бел. актрыса. Нар. артыстка Беларусі (1967). З 1931 у Бел. т-ры імя Я.Коласа, у 1951—74 у Брэсцкім абл.

драм. т-ры. Выканаўца вострахарактарных і камедыйных, лірыка-драм. роляў. Спалучае эмацыянальную напоўненасць вобразаў з яркай і выразнай формай. З найб. значных роляў: Таццяна («Над Бярозай-ракой» П.Глебкі), Паўліна («Пяюць жаваранкі» К.Крапівы), Даша («Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча), Ганна Чыхнюк («Выбачайце, калі ласка!» А.Макаёнка), Аксюша, Белацелава («Лес», «Жаніцьба Бальзамінава» А.Астроўскага), Вольга («Тры сястры» А.Чэхава), Марціна («Лекар паняволі» Мальера) і інш.

Літ.: Волчецкий Л.П. Годы, спектакли, роли... Мн., 1974.

Т.П.**Заранок**.

Т.**Заранок** у ролі Белацелавай.

ЗАРА́НСКАЕ РАДО́ВІШЧА ГЛІН, у Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., каля пас. Зара. Пласты выклад звязаны з адкладамі антопальскага гарызонта неагену. Гліны светла-шэрыя алеўрытавыя каалініт-мантмарыланітавыя (верхні слой), жаўтавата-белыя пескавата-алеўрыцістыя каалінітавыя (сярэдні), стракатакаляровыя пясчаныя каалінітавыя (ніжні), высокапластычныя, тонкадысперсныя, шчыльныя. Разведаныя запасы 5 млн. м^3, перспектыўныя 0,6 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 3,5—11,2 м, ускрышы 1,8—6 м. Гліны прыдатныя на вытв-сць аглапарыту, цэменту (у сумесі з фосфагіпсам), на выраб цэглы і дрэнажных труб.

А.П.Шчураў.

ЗА́РАСТАК, пратал і й, палавое пакаленне (гаметафіт) у вышэйшых споравых раслін — папарацей, хвашчоў, дзеразы. Развіваецца са споры і ўтварае мужчынскія (*антэрыды*) і жаночыя (*архегоніі*) палавыя органы. У насенных раслін моцна рэдукаваны.

Невял. расліна (да 5 см), мае форму цэласнай або рассечанай пласцінкі, ніці, клубеньчыка з рызоідамі на ніжняй паверхні. Жыве нядоўга (толькі З. дзеразы дажывае да 15—20 гадоў). Пасля апладнення на З. з зіготы вырастае бясполае пакаленне (спарафіт), які ўтварае спарангіі са спорамі бясполага размнажэння. Такім чынам адбываецца змена палавога (З.) і бясполага (спарафіт) пакаленняў. Гл. таксама *Чаргаванне пакаленняў*.

ЗАРАТУ́ШТРА, Зараастр, паўлегендарны заснавальнік зараастрызму — стараж.-іранскай рэлігіі, у аснову якой пакладзена ідэя аб непазбежнай перамозе сіл дабра над сіламі зла; стваральнік самай стараж. часткі «*Авесты*». Згодна традыцыі і паводле меркаванняў вучоных, З. жыў і прапаведаваў у 7 — пач. 6 ст. да н.э. на тэр. Усх. Ірана, Сярэдняй Азіі і Афганістана.

А.**Зардаран**. Вясна. 1956.

ЗАРА́ЧЧА, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., на беразе воз. Рака, на аўтадарозе Браслаў—Даўгаўпілс (Латвія). Цэнтр сельсавета. За 8 км на ПнЗ ад г. Браслаў, 228 км ад Віцебска, 38 км ад чыг. ст. Друя. 86 ж., 31 двор (1997). Базавая школа, б-ка. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік архітэктуры — вадзяны млын (канец 18 — 1-я пал. 19 ст.).

ЗАРДАРА́Н Аганес Мкртычавіч (н. 20.1.1918, г. Карс, Турцыя), армянскі жывапісец. Нар. мастак Арменіі (1963). Чл.-кар. АН СССР (1958). Аўтар гіст. карцін («Заложнікі фашызму», 1943), лірычных пейзажаў («Армянскі пейзаж», 1944, «Бераг Севана», 1947, «Бюраканскі восенню», 1959), а таксама пейзажаў з жанравымі матывамі («Вясна», 1956, трыпціх «Абуджэнне», 1971), партрэтаў, нацюрмортаў. Творам характэрна дэкар. спалучэнне гучных, святланосных колеравых плоскасцей. Афармляў спектаклі «Гаянэ» А.І.Хачатурана ў Армянскім акад. т-ры оперы і балета ў Ерэване (1971) і інш., аўтар артыкулаў па пытаннях выяўл. мастацтва.

ЗАРЖЭ́ЦКІ Іосіф Альбертавіч (1800, г.п. Івянец Валожынскага р-на Мінскай вобл. — 10.2.1869), ваенны інжынер. Ген.-лейт. (1864). Скончыў Віленскі ун-т (1826), Пецярбургскі ін-т інжынераў шляхоў зносін (1829). З 1830 у марской буд. часці ў *Кранштаце*. Аўтар праектаў гал. фортаў, а з 1850 — будаўнік (кіраўнік усіх буд. работ) Кранштацкай крэпасці. Аўтар праектаў Балт. порта і гандл. порта на Кананерскім в-ве ў Пецярбургу.

ЗАРНІ́ЦА, успышка святла на гарызонце пры аддаленай навальніцы, калі з-за далёкасці маланкі не відаць, а грому не чуваць. Звычайна назіраецца вечарам або ноччу.

ЗАРНІ́ЦА (Linaria), род кветкавых раслін сям. залознікавых. Больш за 150 відаў. Пашыраны пераважна ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. На Беларусі як дзікарослыя трапляюцца ўсюды З. звычайная, або лянок (L. vulgaris), у паўд. раёнах — жаўтазелялістая (L. genistifolia). Растуць на палях, лугах, у лясах, каля дарог. У культуры вырошчваюць З. мяса-чырвоную (L. incarnata), якая зрэдку трапляецца як здзічэлая.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны з прамастойным ці галінастым сцяблом выш. да 1 м. Лісце сядзячае, чаргаванае або кальчаковае. Кветкі няправільныя з трубчастым, двухгубым вяночкам жоўтага, чырв., белага, сіняга і інш. колеру, з моцна развітым нектарнікам, сабраныя ў верхавінкавыя суквецці. Плод — шматнасенная каробачка. Лек., меданосныя і дэкар. расліны. Некат. віды (напр., З. звычайная) — пустазелле, ядавітыя.

«ЗАРНІ́ЦЫ», літаратурна-мастацкі часопіс ліберальна-асветнага кірунку. Вы-

даваўся ў Гомелі з 26.11(9.12).1911 да 15(28).6.1912 адзін раз у 2 тыдні на рус. мове. Спрыяў яднанню маладых пісьменнікаў, крытыкаў і публіцыстаў. У паэзіі пераважалі элегічныя матывы С.Надсана і ранніх сімвалістаў, апавяданні больш нагадвалі эскізы на мясцовыя тэмы, чым закончаныя творы. Змяшчаў літ.-крытычныя ацэнкі творчасці І.Нікіціна, Надсана, К.Бальмонта, М.Дабралюбава, музыкі Ф.Ліста, М.Рымскага-Корсакава. *У.М.Конан.*

ЗАРО́ДАК у жывёл і чалавека, эмбрыён, арганізм на першых стадыях развіцця (ад яйца да здольнасці самастойна жыць і перамяшчацца). Развіваецца з аплодненага яйца (*зіготы*) і жывіцца назапашанымі ў ім пажыўнымі рэчывамі (у птушак) ці за кошт матчынага арганізма (у млекакормячых жывёл і чалавека). У акушэрстве — арганізм чалавека на працягу першых 8 тыдняў ва ўлонні маці. У раслін — зачатак папарацепадобных і насенных раслін, пач. этап іх развіцця — *антагенез*. Гл. таксама *Аплодненне*.

ЗАРО́ДКАВАЕ РАЗВІЦЦЁ, гл. *Эмбрыягенез*.

ЗАРО́ДКАВЫ МЯШО́К, цэнтральная частка семязавязі кветкавых раслін, у якой развіваецца яйцаклетка і адбываецца *двайное апладненне*; палавое пакаленне пакрытанасенных раслін — жаночы *гаметафіт*. Пасля двайнога апладнення з З.м. развіваецца зародак расліны і *эндасперм*.

Зарніца звычайная.

ЗАРО́ДКАВЫЯ ЛІСТКІ́, зародкавыя пласты, слаі клетак зародка шматклетачных жывёл і чалавека, што ўтвараюцца ў працэсе *гаструляцыі*. Адрозніваюць тры З.л.: вонкавы — эктадэрма, сярэдні — мезадэрма, унутраны — энтадэрма. Кожны З.л. складаецца з маладыферэнцыраваных клетак з вял. магчымасцямі развіцця і дае пачатак пэўнай групе тканак і органаў. Тканкавая спецыфічнасць вытворных З.л. захоўваецца і ва ўмовах росту пухлін.

ЗАРО́НАВА, Заронаўскае возера, на мяжы Віцебскага і Шумілінскага р-наў Віцебскай вобл., у бас. р. Шэвінка, за 12 км на У ад г.п. Шуміліна. Пл. 3,61 км^2, даўж. 7,6 км, найб. шыр. 1,1 км, найб. глыб. 13,5 м, даўж. берагавой лініі 21,3 км. Пл. вадазбору 147 км^2. Схілы катлавіны выш. 10—17 м (на зах. 5—10 м), разараныя, часткова пад лесам і хмызняком. Берагі пясчаныя і пясчана-галечныя, месцамі супадаюць са схіламі, у залівах на З і У сплавінныя. Падводная ч. катлавіны падзяляецца на некалькі замкнёных глыбакаводных плёсаў. На ПдУ 5 астравоў агульнай пл. 3 га. Мелкаводдзе шырокае, пясчанае, уздоўж паўн. берагоў пясчана-галечнае з валунамі. Глыбакаводная зона глеістая. Упадаюць 10 ручаёў, у т.л. з воз. Княжно; на З выцякае р. Заронаўка. Уваходзіць у зону адпачынку Заронава.

Кераміка **зарубінецкай культуры**.

ЗАРУБІНЕ́ЦКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура плямён ранняга жалезнага веку ў Сярэднім і Верхнім Падняпроўі, Прыпяцкім Палессі. Назва ад могільніка каля в. Зарубінцы на Кіеўшчыне. Насельніцтва З.к. займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рамёствамі; жыло на неўмацаваных *селішчах*, выкарыстоўвала *гарадзішчы* папярэдняй *мілаградскай культуры*; будавала наземныя слупавыя жытлы (аднакамерныя, прамавугольныя або квадратныя ў плане) і паўзямлянкі. У адным з кутоў жытла ці каля сцяны знаходзілася агнішча, пазней — глінабітная печ. Побач з жытламі размяшчаліся гасп. і вытв. пабудовы, ямы-пагрэбы. Пахавальныя абрады — трупаспаленне, зрэдку трупапалажэнне. Могільнікі не маюць вонкавых адзнак. У Верхнім Падняпроўі выяўлены ямныя трупаспаленні і *кенатафы*, у Прыпяцкім Палессі — ямныя і урнавыя пахаванні са спальваннем і пахаваннем чарапоў. У магілах трапляюцца прылады працы, посуд, упрыгожанні. Насельніцтва вырабляла і выкарыстоўвала жал. наканечнікі коп'яў, клінападобныя сякеры (кельты), нажы, сярпы, ляпны посуд, культавыя вырабы і інш. Падтрымлівалі сувязі са скіфскімі, сармацкімі, кельцкімі плямёнамі, гарадамі Паўн. Прычарнамор'я. Большасць даследчыкаў лічыць З.к. старажытнаславянскай. Найб. даследаваны археал. помнік *Чаплін* Лоеўскага р-на. *Л.Д.Побаль.*

ЗАРУ́БЫ, вёска ў Дубровенскім р-не Віцебскай вобл., на р. Расасенка, на аўтадарозе Дуброўна — в. Баева. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 15 км на ПдУ ад г. Дуброўна, 107 км ад Віцебска, 24 км ад чыг. ст. Асінаўка. 472 ж., 190 двароў (1997). Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

ЗАРУДА́ЎЕ, вёска ў Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 16 км на Пд ад горада і 14 км ад чыг. ст. Масты, 76 км ад Гродна. 387 ж., 155 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам.

ЗАРУДЗЕ́ЧА, рака ў Глускім р-не Магілёўскай вобл., правы прыток р. Пціч (бас. р. Прыпяць). Даўж. 22,4 км. Пл. вадазбору 141 км^2. Пачынаецца за 3 км на ПнЗ ад в. Макавічы. Асн. прыток — ручай Камарынка (злева). Рэчышча на ўсім працягу каналізаванае.

ЗАРУ́ДНЫ Іван Пятровіч (? — 1727), расійскі архітэктар і мастак. Ураджэнец Украіны. З 1701 на царскай службе ў Маскве. У 1704—07 пабудаваў царкву архангела Гаўрыіла (т.зв. Меншыкаву вежу), у якой традыц. кампазіцыя рус. шмат'ярусных цэркваў спалучана з арх. элементамі і дэкар. дэталямі барока. Барочныя рысы маюць таксама царква Івана Воіна (1709—13, Масква; прыпісваецца З.), і асабліва складаныя шмат'ярусныя іканастасы Праабражэнскага сабора (1719, Талін) і сабора Петрапаўлаўскай крэпасці (1722—27, С.-Пецярбург), зробленыя па яго малюнках.

ЗАРУ́ДНЫ Мікола (Мікалай Якаўлевіч; н. 20.8.1921, в. Арэхавец Кіеўскай вобл.), украінскі пісьменнік. Скончыў Казахскі ун-т (1942). Дэбютаваў аповесцю «Мае землякі» (1950). Аўтар зб. апавяданняў «Святло» (1961), раманаў «На белым свеце» (1967), «Уран» (1970), «Гілея» (1973), гіст. драмы «За Сібір'ю сонца ўсходзіць» (1980) і інш. У п'есах «На крутых берагах» (1955), «Калі ты любіш» (1959), «Мёртвы бог» (1960), «Вострай тваёй мары» (паст. 1962, выд. 1963), «Фартуна» (паст. і выд. 1966) і

інш. мастацкае асэнсаванне актуальных праблем сучаснасці, сац. і духоўных пераўтварэнняў на вёсцы, падзей Вял. Айч. вайны. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1978. На бел. мову асобныя творы З. пераклаў А.Макаёнак.

Тв.: Твори. Т. 1—4. Київ, 1981—82; Бел. пер. — «За Сібір'ю сонца ўсходзіць...» // Полымя. 1982. № 2.

І.Зарудны. Меншыкава вежа ў Маскве. 1704—07.

ЗАРУ́ЖАННЕ, Р у ж ы н а, возера ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лукомка, за 20 км на ПнУ ад г. Лепель. Пл. 0,37 км^2, даўж. 1,3 км, найб. шыр. 500 м, даўж. берагавой лініі каля 3,2 км. Пл. вадазбору 9,44 км^2. Схілы катлавіны выш. да 10 м (на У да 2 м), пад хмызняком, на Пн, ПнЗ і У разараныя. Берагі нізкія, пераважна забалочаныя. Злучана ручаём з воз. Несіна. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. каналаў.

ЗАРУ́ЧЫНЫ, у беларусаў традыцыйны абрад падрыхтоўчага этапу *вяселля*, на якім канчаткова замацоўвалася згода сваякоў на шлюб маладых. Адбываліся праз тыдзень пасля запоін, калі нявеста і яе бацькі афіцыйна давалі згоду на шлюб. На З. дамаўляліся пра ўсе дэталі вяселля (пасаг, час і парадак вяселля, колькасць гасцей і г.д.). Жаніх і нявеста абменьваліся пярсцёнкамі і абрадавымі падарункамі, а іх рукі звязвалі ручніком; падарункамі абменьваліся і іх бацькі, якія пасля ўдзельнічалі ў сумесным пачастунку, што замацоўваў заключаны дагавор. Вяселле з гэтага часу абвяшчалася афіцыйна, а жаніха і нявесту называлі малады і маладая.

Л.А.Малаш.

ЗАРХІ́ Аляксандр Рыгоравіч (н. 18.2.1908, С.-Пецярбург), рускі кінарэжысёр, сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1969), засл. дз. маст. Беларусі (1955). Герой Сац. Працы (1978). Скончыў Ленінградскі тэхнікум экраннага мастацтва (1927). З 1929 на Ленінградскай кінафабрыцы «Саўкіно» (кінастудыя «Ленфільм»), у 1950—55 на кінастудыі «Беларусьфільм», з 1957 на кінастудыі «Масфільм». Творчай манеры З. ўласцівы імкненне да абагульнення, псіхал. глыбіні ў раскрыцці вобразаў. Паставіў фільмы: маст. «Гарачыя дзянёчкі» (1935), «Дэпутат Балтыкі» (1937) і «Член урада» (абодва з І.Хейфіцам; 1940); «Паўлінка» (1952, фільм-спектакль), «Несцерка» (1955), «Вышыня» (1957), «Людзі на мосце» (1960), «Ганна Карэніна» (1968), «Дваццаць шэсць дзён з жыцця Дастаеўскага» (1981) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1941, 1946.

ЗАРЫБЛЕ́ННЕ в а д а ё м а ў, выпуск у вадаёмы каштоўных відаў рыб для якаснага паляпшэння (рэканструкцыі) іх іхтыяфауны і павелічэння запасаў прамысл. рыб, а таксама з мэтай акліматызацыі рыб, арганізацыі іх нагляду. Зарыбляюць найчасцей вадаёмы, кармавыя рэсурсы якіх выкарыстоўваюцца няпоўнасцю. Для З. бяруць лічынак, сяголеткаў, гадавікоў, двухгодак, вытворнікаў. Іх гадуюць у сажалкавых і азёрна-таварных рыбных гаспадарках, рыбагадавальніках. Для З. вадаёмаў Беларусі выкарыстоўваліся: карась сярэбраны, сомік амерыканскі, стронга радужная, судак, сіговыя рыбы, амуры белы і чорны, таўсталобікі стракаты і звычайны. З 1956 вядзецца З. азёр вугром еўрапейскім. Азёрна-таварныя і сажалкавыя рыбныя гаспадаркі зарыбляюцца пераважна полікультурай (разам з карпам гадуюць шчупака, карасёў залатога і сярэбранага, сазана амурскага, таўсталобікаў, пелядзь і інш.).

ЗАРЫ́Н, і з а п р а п і л а в ы э ф і р м е т ы л ф т о р ф а с ф о н а в а й к і с л а т ы, *атрутнае рэчыва* нервова-паралітычнага дзеяння. Вельмі таксічны. Асабліва хутка выклікае пашкоджанне арганізма пры інгаляцыі (міёз, цяжкасць дыхання). Лятальная таксічная доза (умоўна) 0,1 мг·мін/л.

Вадкасць без колеру і паху, $t_{кіп}$ 151,5 °С (кіпіць з раскладаннем), шчыльн. 1094 кг/м^3 (20 °С). Змешваецца ва ўсіх адносінах з вадой і арган. растваральнікамі. Гідралізуецца воднымі растворамі шчолачаў, аміяку і амінаў (рэакцыі выкарыстоўваюць для дэгазацыі З.).

ЗА́РЫНЬ, З а р ы н ь ш (Zariņš) Індуліс Аўгуставіч (н. 18.6.1929, Рыга), латышскі жывапісец. Нар. мастак Латвіі (1977), засл. дз. маст. Латвіі (1965). Чл.-кар. АМ СССР (1967). Вучыўся ў АМ у Рызе (1952—58). Аўтар карцін на тэмы сучаснасці і гісторыка-рэв. зместу («Песня жніва», 1977, трыпціх «Салдаты рэвалюцыі», 1962—65, «Палі нашыя», 1980), партрэтаў («Т.Залькалн», 1976—77), нацюрмортаў («Нацюрморт майго дзядулі», 1962) і інш. Творам характэрны манументальнасць, строгая рытмічная арганізацыя кампазіцыі, эмацыянальнасць колеравага вырашэння.

І.**Зарынь**. Палі нашыя. 1980.

ЗА́РЫНЬ, З а р ы н ь ш (Zariņš) Яніс Пятровіч (25.5.1913, г. Руіена, Латвія — 1993), латышскі скульптар. Нар. мастак Латвіі (1988), засл. дз. маст. Латвіі (1971). Вучыўся ў АМ у Рызе (1936—

Л.Букоўскі, Я.**Зарынь**, А.Скарайніс. Саласпілскі мемарыял. Цэнтральная група. 1967.

42). Развіваў традыцыі лат. манум. скульптуры. Аўтар партрэтаў («Рута», 1944), помнікаў («Змагарам рэвалюцыі 1905 г.», 1960), надмагілляў, дэкар. кампазіцый для садоў і паркаў («Раніца», 1958), кампазіцый («Думкі», 1938, «Элегія», 1967, «Вечнасць», 1970). Адзін са стваральнікаў мемар. ансамбля памяці ахвяр фашызму ў Саласпілсе (1967).

ЗА́РЫНЬШ (Zariņš) Карліс (н. 6.7.1930, Рыга), латышскі спявак (драм. тэнар). Нар. арт. Латвіі (1972), нар. арт. СССР (1976). Скончыў Латв. кансерваторыю (1960), з 1972 выкладае ў Латв. муз. акадэміі (праф. з 1983). З 1960 саліст Нац. оперы Латвіі. Сярод партый: Тотс («Іграў я, скакаў» І.Калніньша), Віжут («Банюта» А.Калніньша), Кангар («Агонь і ноч» Я.Медыньша), Рыгор («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Герман («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Тангейзер, Зігмунд («Тангейзер», «Валькірыя» Р.Вагнера), Радамес, Атэла, Манрыка («Аіда», «Атэла», «Трубадур» Дж.Вердзі), Рудольф, Калаф («Багема», «Турандот» Дж.Пучыні), Хазэ («Кармэн» Ж.Бізэ), Пітэр Граймс («Пітэр Граймс» Б.Брытэна); сола тэнара ў рэквіемах В.А.Моцарта і Вердзі, «Месіі» Г.Ф.Гендэля, 9-й сімфоніі Л.Бетховена. Дзярж. прэмія Латвіі 1974.

ЗА́РЫНЬШ (Zariņš) Маргерс (н. 24.5.1910, г.п. Яўнпіебалга, Латвія), латышскі кампазітар, пісьменнік. Нар. арт. СССР (1970). У 1929—33 вучыўся ў Латв. кансерваторыі. У 1940—50 муз. кіраўнік Маст. т-ра імя Я.Райніса ў Рызе. У муз. творчасці пераважае тэатр. стыхія, парадыйна-сатыр. вобразнасць, з 1960-х г. — рысы неакласіцызму. Сярод муз. твораў: оперы «Да новага берага» (1955), «Зялёны млын» (1958), «Опера жабракоў» (1964), «Цуд св. Маўрыкія» (опера-балет, 1975), «Опера на плошчы» (1970); араторыі «Валміерскія героі» (1950), «Махагоні» (1965); канцэрты для аргана і камернага арк. Concerte innocente (1969), Concerto triptichon (1972); вак. творы, хары, музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Аўтар літ.-маст. твораў, у т.л. сатырыка-фантаст. рамана «Фальшывы Фауст, або Перапрацаваная і дапоўненая кулінарная кніга» (1973), «Містэрыі і хэпенінгі» (1975), зб. апавяданняў. Дзярж. прэмія СССР 1950. Дзярж. прэмія Латвіі 1958. На бел. мову асобныя літ. творы З. пераклаў А.Марціновіч.

Тв.: Рус. пер. — Оптимистическая энциклопедия жизни. Л., 1986; Календарь капельмейстера Коциня: Роман, повесть. М., 1987.

Літ.: Курышева Т.А. Маргер Заринь. М., 1980.

ЗАРЫ́ПАЎ Хакім Карымавіч (н. 17.9.1924), узбекскі артыст цырка. Нар. арт. Узбекістана (1964), нар. арт. СССР (1980). Вучыўся ў Ташкецкай кансерваторыі. З 1938 у групе «Джыгіты Узбекістана» пад кіраўніцтвам бацькі — Карыма З., з 1952 кіраўнік гэтага цыркавога ансамбля. Выступленні вылучаюцца тонкім выканаўчым майстэрствам, складанымі трукавымі камбінацыямі («Уральскія вяртушкі», «Абаротны доўгі абрыў»).

ЗАРЫ́ЦКІ Аляксей Аляксандравіч (22.3.1911, г.п. Хоцімск Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 29.10.1987), бел. паэт. Скончыў Маскоўскі ін-т замежных моў (1936). Першы зб. вершаў «Эпічныя фрагменты» (1932). Апавядальнасць, стрыманасць пачуццяў, лі-

А.А.Зарыцкі.

рызм, уменне раскрыць філас. сэнс у звычайных з'явах — асн. рысы яго паэзіі. Найб. уласцівыя яму жанры эпічнай паэзіі — сюжэтна-лірычны верш, блізкі да балады (зб-кі вершаў і паэм «Дняпроўскае рэха», 1946, «Размова з сэрцам», 1961, «Мая асяніна», 1973, «Каля вячэрняга кастра», 1979, і інш.). У многіх вершах і паэмах адлюстраваны падзеі Вял. Айч. вайны. Аўтар паэм «Аповесць пра залатое дно» (1954), «Марыля» (1965), «На волю» (1969) і інш. У паэме «Вяртанне на Зямлю» (1964) паказаў імкненне чалавека да ведаў, да пазнання таямніц сусвету. Гумарыстычныя і сатыр. творы ў зб-ках «Пасылка ў рай» (1960), «Талоны на бяссмерце» (1974). Пераклаў на бел. мову паэму К.Данелайціса «Чатыры пары года» (1961), аповесці Г.Зэгерс «Чалавек і яго імя» (1958), Ю.Брэзана «Крыста» (1966) і інш.

Тв.: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1981; За словам-падарункам. Мн., 1985; Трывожная госця. Мн., 1986.

А.С.Гурская.

ЗАРЫ́ЦКІ Эдуард Барысавіч (н. 9.2.1946, г. Красны Кут Саратаўскай вобл., Расія), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1970, клас А.*Багатырова*). У 1973—82 загадваў муз. часткай Бел. рэсп. т-ра юнага гледача. Працуе пераважна ў галіне інструментальнай музыкі (апіраецца на класічныя традыцыі), масавай і эстр. песні, тэатр. і кінамузыкі. Сярод твораў: сімфонія (1970), сюіта (1980), канцэрціна «Пастараль» (1977) для сімф. арк.; канцэрты для габоя (1973) і валторны (1974) і камернага арк.; Капрычыо для фп. з камерным арк. (1978), сюіта на тэмы бел. нар. песень для нар. арк. (1976); камерна-інстр. музыка; сюіты з музыкі да спектакляў «Дванаццатая ноч», «Снежная каралева», «Тэатральная сюіта».

ЗА́РЫЯ (Zaria), горад у паўн. ч. Нігерыі, у штаце Кадуна. Засн. каля 1536. Каля 350 тыс. ж. (1995). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Цэнтр гандлю бавоўнай, тытунём, арахісам. Прам-сць: бавоўнаачышчальная, тэкст., алейная, тытунёвая, хім., мэблевая, паліграф., маш.-будаўнічая. Традыц. рамёствы: ткацтва, фарбаванне тканін, дубленне скур. Ун-т.

ЗАРЭ́МБА Мікалай Іванавіч (15.6.1821, Віцебская губ. — 8.4.1879), музычны тэарэтык, педагог, кампазітар. Скончыў Пецярбургскі ун-т. Ігры на фп. і віяланчэлі вучыўся ў А.Герке і І.Гроса, тэорыю музыкі вывучаў у А.Б.Маркса ў Берліне. З 1859 выкладаў у Муз. класах Пецярбургскага аддзялення Рас. муз. т-ва. З 1862 праф. Пецярбургскай кансерваторыі, у 1867—71 яе дырэктар. Распрацаваў «Інструкцыю для Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі», якая садзейнічала ўпарадкаванню навуч. працэсу і стала асновай працы кансерваторыі. Аўтар араторыі «Іаан Хрысціцель», сімфоніі, хароў. Сярод яго вучняў Г.*Ларош*, П.*Чайкоўскі*.

ЗАРЭ́МБА Міхась (Міхаіл Мікалаевіч; н. 2.1.1941, в. Знаменка Лагойскага р-на Мінскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1965). Працаваў у прэсе, з 1989 у выд-ве «Юнацтва». Друкуецца з 1956. Аўтар кн. аповесцей і апавяданняў для дзяцей з займальнымі сюжэтамі, жывымі вобразамі: «Камандзір зялёнага патруля» (1967), «Бі, барабан!» і «Загадка без адгадкі» (1972), «Хто-каго?» (1978), «Пераправа» (1987), «Сакрэт тэлепата» (1989), «Дзень магнітнай буры» (1992), «Арэхавы спас» (1997). У сваіх творах ставіць праблемы ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, ролі сям'і і школы ў выхаванні падлеткаў. На бел. мову пераклаў раман Г.Уэлса «Чалавек-невідзімка» (1997), а таксама творы рус. і ўкр. пісьменнікаў.

ЗАРЭ́СЦЕ, вадасховішча ў Магілёўскім р-не, за 32 км на ПдУ ад Магілёва, каля в. Зарэсце. Створана на р. Раста ў 1981. Пл. 0,71 км^2, даўж. 2,4 км, найб. шыр. 400 м, найб. глыб. 5,3 м, аб'ём вады 1 млн. м^3. Ваганні ўзроўню на працягу года 2 м. Выкарыстоўваецца для арашэння.

ЗАРЭ́ЦКАЯ Соф'я Майсееўна (1881, г. Полацк Віцебскай вобл. — пасля 1934), дзеяч рэв. руху. З 1899 удзельнічала ў с.-д. гуртках Пецярбурга, Екацярынаслава, Харкава, Полацка. У 1904 у Швейцарыі, далучылася да меншавікоў. Са студз. 1905 у Расіі, чл. аб'яднанага ЦК РСДРП. Сакратар с.-д. фракцый 1, 2 і 4-й Дзярж. думы. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. выканкома Маскоўскага Савета. На 1-м Усерас. з'ездзе Саветаў выбрана чл. ВЦВК, са жн. 1917 чл. ЦК РСДРП (меншавікоў). Кастр. рэвалюцыю 1917 не прыняла. У 1921 жыла ў Ніжагародскай губ., у 1932 — у Ніжнім Ноўгарадзе, у 1934 — у Цверы.

Э.А.Ліпецкі.

ЗАРЭ́ЦКАЯ ВІНАКУ́РНА-ДРО́ЖДЖАВАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1884—1914 у маёнтку Зарэчча Сенненскага

пав. (цяпер вёска ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл.). Вырабляла прасаваныя сухія дрожджы, хлебны спірт-сырэц. У 1895—1913 была паравая машына (17 к.с.) і 3 паравыя катлы. У 1906 працавалі 84 чал.

ЗАРЭ́ЦКІ Міхась (сапр. Касянкоў Міхаіл Яўхімавіч; 20.11.1901, с. Высокі Гарадзец Талачынскага р-на Віцебскай вобл. — 29.10.1937), бел. пісьменнік. Скончыў Аршанскае духоўнае вучылішча, вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі. Служыў перапісчыкам у паўвайсковай часці, настаўнічаў на Магілёўшчыне, узначальваў Шклоўскі валасны аддзел нар. асветы. У 1920—27 палітработнік Чырв. Арміі. Адзін з арганізатараў літ. аб'яднання «*Маладняк*», пасля ўваходзіў у аб'яднанне «*Полымя*». У ліст. 1936 па ілжывым даносе арыштаваны. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957. Літ. дзейнасць пачаў у 1922 (апавяд. «Ці ж так?», «Спатканне», «Цімка Бабыль» у газ. «Савецкая Беларусь»). Гал. тэма творчасці ранняга перыяду (зб-кі апавяданняў «У віры жыцця», «Пела вясна», абодва 1925, «Пад сонцам», 1926) — перамены ў жыцці народа пад уздзеяннем рэвалюцыі, барацьба старога і новага, цяжкія пошукі шляхоў да будучыні. Распрацоўваў новую ў бел. л-ры тэму «былых», «учарашніх», тэму трагічнага лёсу прадстаўнікоў пераможаных рэвалюцыяй класаў. Гэтыя творы («Ворагі», «Кветка пажоўклая») прасякнуты гуманіст. пафасам, ідэяй спачування і міласэрнасці да ахвяр рэвалюцыі, учарашніх ворагаў. Апавяданні 1920-х г. вылучаюцца глыбокай змястоўнасцю, напружанасцю сюжэта, вастрынёй канфліктаў, псіхалагізмам, увагай да ўнутранага свету герояў, іх пачуццяў і перажыванняў. Як мастак і крытык распрацоўваў канцэпцыю «пазітыўнага рамантызму», рамант. стылявой плыні. Не прымаў пасіўнае адлюстраванне рэчаіснасці, статычнасць, кампазіцыйную аморфнасць, уласцівую тагачаснай бел. прозе апісальнасць, адстойваў суверэннасць і духоўную свабоду чалавека. На шляху яго ідэйна-творчага і светапогляднага развіцця заканамерным быў пераход ад «малой прозы» да буйных жанравых форм — аповесці «Голы звер» (1926), раманаў «Сцежкі-дарожкі» (1927), «Вязьмо» (1932). У аповесці пераканана выкрываюцца негатыўныя з'явы паслярэв. рэчаіснасці і носьбіты філасофіі эгаізму, індывідуалізму, абывацельскай маралі. Раман «Сцежкі-дарожкі» закладваў плённую традыцыю праўдзівага маст. асэнсавання рэвалюцыі ва ўсёй яе складанасці і супярэчлівасці, без ідэалізацыі і псеўдагероікі. У святле гуманіст. ідэалаў паказаны пакутлівы шлях інтэлігенцыі ў рэвалюцыю, выяўлены розныя погляды яе прадстаўнікоў на сродкі ажыццяўлення рэв. мэт. Маральна-этычным праблемам прысвечаны п'есы «Віхор на балоце» (1928) і «Белыя ружы» (1928—29), вытрыманыя ў рамант. ключы з выкарыстаннем элементаў прыгодніцтва і меладрамы, сімволіка-алегарычных вобразаў, фалькл. паданняў і літ. рэмінісцэнцый. П'есы апасродкавана звязаны з тэатр. дыскусіяй і абмеркаваннем праблем развіцця бел. кіно (арт. «Два экзамены: (Да пытання аб тэатральнай крытыцы» і «Чым пагражае нам Белдзяржкіно», 1928). Беспадстаўныя абвінавачанні вульгарызатарскай крытыкі ў прапагандзе антысав. поглядаў («Падарожжа на новую зямлю», 1929) перашкодзілі завяршэнню рамана «Крывічы» («Полымя», 1929, № 4), негатыўна паўплывалі на творчую дзейнасць З. (апавяданні «Хвіліна», «Пра дзеда Альпіна»). У рамане «Вязьмо» пераадолены творчыя цяжкасці, з выразна грамадз. пазіцый асвятляюцца трагічныя падзеі масавай калектывізацыі, у сюжэтна-вобразнай форме праводзіцца ідэя яе эканам. немэтазгоднасці і маральнай недапушчальнасці гвалтоўнага рассялянівання сялянства, прымусовага разбурэння вясковага ўкладу жыцця. Раман прасякнуты пафасам абароны чалавека як найвышэйшай каштоўнасці. Выступаў як літ. крытык (арт. «Размова незвычайнае шчырасці», 1932, і інш.), нарысіст («Вясна 1930 года», 1930, «Новы вобраз Беларусі», 1934, і інш.), перакладчык («Цэмент Ф.Гладкова, 1930, «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў сусветную вайну» Я.Гашака, ч. 1, 1931).

М.Зарэцкі.

Н.Зар'ян.

Тв.: Зб. твораў. Т. 1—4. Мн., 1989—92.

Літ.: Майсеенка А.Ф. Творчасць Міхася Зарэцкага. Мн., 1978; Мушынскі М.І. Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага. Мн., 1991. *М.І.Мушынскі.*

ЗАРЭ́ЧАНСКІ ВАЛУ́Н, помнік прыроды ў Беларусі. За 0,5 км на Пд ад в. Зарэчча Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Буйны ледавіковы валун светла-ружовага граніту рапаківі з крышталямі палявога шпату ў выглядзе авоідаў. Даўж. 3,3 м, шыр. 2,2 м, выш. 2,2 м, у абводзе 8,6 м, аб'ём 8,5 м^3, маса каля 22 т. Прынесены ледавіком каля 220—110 тыс. г. назад з Выбаргскага масіву. Мае 33 штучныя паглыбленні паўсферычнай формы (4—6 см у папярочніку, да 2 см глыбіні), зробленыя чалавекам каля 2—2,5 тыс. г. назад. У язычніцкія часы — прадмет пакланення. *В.Ф.Вінакураў.*

ЗАРЭ́ЧНЫ (сапр. Рублёў) Цімох Міронавіч (1909, в. Будзіна Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл. — 1944?), бел. пісьменнік. Скончыў Мінскі вышэйшы пед. ін-т (1933). З 1928 працаваў у газ. «Савецкая Беларусь». У 1933—35, 1939—41 Бел. радыёкамітэце, у 1936—40 настаўнік у Мінску (адначасова ў 1936—39 у Ін-це школьнай педагогікі). У час Айч. вайны настаўнічаў у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Друкаваўся з 1928. Распрацоўваў жанры фельетона, апавядання, аповесці («Эльбрусы чалавечага шчасця», 1931, «Зямля ў вятрах», 1931, «Маці і сын», 1935, «Андрэй Блажко», 1940), рамана («Белы Камень», 1932). На бел. мову пераклаў раманы Г.Уэлса «Першыя людзі на месяцы», Ф.Беразоўскага «Бабскія сцежкі» (абодва 1931), М.Сервантэса «Дон Кіхот Ламанчскі» (1935), аповесці А.Новікава-Прыбоя «Жанчына ў моры» і В.Фінка «Іншакраінны легіён» (1936) і інш.

Тв.: Сустрэчы: Нарысы і фельетоны. Мн., 1930; Узбунтаваная зямля: Нарысы. Мн., 1930; Маладосць: Навелы і апавяданні. Мн., 1931; Паэма пра гераізм. Мн., 1932; Пажары: Нарысы і фельетоны. Мн., 1933; Рудзянскі пастушок. Мн., 1941.

Літ.: Кныш С., Скалабан В. Рукою Зарэчнага // ЛіМ. 1998. 13 лют. *І.У.Саламевіч.*

ЗАРЭ́ЧЧА, гарадскі пасёлак у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. каля аўтадарогі Рэчыца—Светлагорск. За 30 км ад горада і чыг. ст. Рэчыца, 80 км ад Гомеля. 2 тыс. ж. (1997). Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

ЗАРЭ́ЧЧА, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 44 км на ПнУ ад г.п. Лагойск, 84 км ад Мінска, 56 км ад чыг. ст. Радашковічы. 339 ж., 105 двароў (1997). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Магілы партызан, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАРЭ́ЧЧА, радовішча глін у Брэсцкім р-не, каля в. Буякі. Пласты паклад звязаны з азёрна-алювіяльнымі адкладамі паазерскага ледзянення. Гліны ад блакітна- да буравата-шэрых, сярэднедысперсныя, сярэднепластычныя, шчыльныя. Разведаныя запасы 4,9 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 3,5—7,6 м, ускрышы (торф, супесі, суглінкі, пяскі) 1,1—5,7 м. Гліны прыдатныя на выраб цэглы і пячных кафляў. *А.П.Шчураў.*

«ЗАРЯ́», літаратурна-грамадскі рукапісны часопіс. Выдаваўся ў 1910 у г. Капыль Мінскай вобл. на рус. мове гуртком «Самаразвіццё і самаадукацыя». У ім супрацоўнічалі З.Жылуновіч (Ц.Гартны), А.Гурло, Х.Станілевіч, Х.Чарнышэвіч і інш. Меў раздзелы белетрыстыкі, літ. крытыкі і публіцыстыкі. У часопісе змешчаны апавяданні Н.Беленькага «Сухотны» і А.Неўліна «Ахвяра», вершы. У крытычных артыкулах, скіраваных супраць дэкадэнтаў і мадэрністаў, высока ацэньвалася бел. паэзія, адзначалася яе цесная сувязь з нар. жыццём. Выйшла 15 нумароў. *А.М.Клачко.*

«ЗАРЯ́», грамадска-паліт. газета. Выходзіць з 1939 у Брэсце 3 разы на тыдзень на рус. і бел. мовах. У 1939 наз. «Рабочий», у маі 1943 — ліп. 1944 выдавалася падпольна. Асвятляе падзеі грамадска-паліт., эканам. і культ. жыцця Брэстчыны. Змяшчае на літ. старонках «Заранка» маст. творы, «Далягляд» — матэрыялы па л-ры і мастацтве, гіст.-культурнай спадчыне. *П.В.Ялец.*

ЗАР'ЯН Наіры (сапр. Егіязар'ян Аястан; 13.1.1901, с. Хараконіс, Зах. Арменія, цяпер тэр. Турцыі — 12.7.1969), армянскі пісьменнік. Скончыў Ерэванскі ун-т (1928). Друкаваўся з 1921. Аўтар зб-каў паэзіі «Блакітная краіна каналаў» (1926), «Вечныя вяршыні» (1937), «Ратны кліч» (1941), «Распаленай душой» (1942), рамана «Ацаван» (1937—47) і інш., у якіх адлюстраваў сац.-псіхал. працэсы ў вёсцы ў перыяд калектывізацыі. Раман «Пятрас і яго міністры» (1958) пра Арменію ў час панавання дашнакаў; аповесць «Давід Сасунскі» (1966) створана па матывах эпасу. Сатырычны талент З. выявіўся ў рамане «Другое жыццё» (1965—67). Вядомы як драматург (гіст. трагедыя «Ара Прыгожы», 1946; камедыі «Ля крыніцы», 1948; «Доследнае поле», 1950). Пераклаў на арм. мову асобныя творы Я.Купалы. На бел. мову яго творы пераклаў Х.Жычка. *С.Арзуманян.*

ЗАР'ЯН (сапр. Аракелян) Стафан (16.9.1890, с. Каракліс, Арменія — 15.10.1968), армянскі пісьменнік. Друкаваўся з 1909. У зб. апавяданняў «Сумныя людзі» (1918), апавяданнях і аповесцях 1918—25 паказаў духоўны свет суайчыннікаў, складаныя сац. працэсы тагачаснасці. Гераічнаму мінуламу Арменіі прысвяціў гіст. трылогію «Цар Пап» (1944), «Армянская крэпасць» (1959), «Вараздат» (1968). Аўтар аўтабіягр. рамана «Гісторыя аднаго жыцця» (т. 1—2, 1934—38). Пераклаў на арм. мову раман Л.Талстога «Вайна і мір», творы І.Тургенева і інш. На бел. мову асобныя творы З. пераклалі М.Татур, М.Гіль.

ЗАСА́ДА, 1) загадзя і старанна замаскіраванае размяшчэнне воінскага падраздзялення (або партызан) на найб. верагодных шляхах руху праціўніка з мэтай яго разгрому раптоўным ударам, захопу палонных і знішчэння баявой тэхнікі. 2) У Стараж. Русі — гарнізон у горадзе на чале з засадным ваяводам; войскі рэзерва (таксама засадны полк), падрыхтаваныя для нечаканага нападу на праціўніка. Напр., у *Кулікоўскай бітве 1380* засадны полк на чале з *Баброкам-Валынскім* і Уладзімірам Серпухаўскім вырашыў зыход бою.

ЗАСАЛЕ́ННЕ ВОД, тое, што *Мінералізацыя вод.*

ЗАСАЛЕ́ННЕ ГЛЕ́БЫ, працэс назапашвання ў глебе лёгкараствараль-ных у вадзе солей у колькасцях, таксічных для с.-г. культур. Найб. развіта ва ўмовах засушлівага клімату пры цяжкім адтоку паверхневых і грунтавых вод. Адрозніваюць першаснае (прыроднае) і другаснае (антрапагеннае) З.г., якое выклікаецца парушэннем рэжымаў гідрамеліярацыі, асабліва ў паўд. зонах інтэнсіўнага арашэння. У пустыннай, паўпустыннай і сухастэпавай зонах фарміруюцца *саланчакі, саланцы* і саланчакаватыя глебы з рознай ступенню і тыпам засалення. На Беларусі З.г. пераважна лакальнае, мае антрапагенны характар (напр., у зоне дзеяння калійных камбінатаў Салігорска). Магчыма і прыроднае З.г. (напр., утварэнне карбанатных жалезіста-саланчакаватых дзярновых забалочаных глеб у некат. раёнах Палесся). З.г. ліквідуюць прамыўным паліваннем з штучным адвядзеннем грунтавых і прамыўных вод з дапамогай дрэнажу, хім. меліярацый, агратэхн., бія-л. і інш. прыёмаў. *Л.В.Круглоў.*

ЗАСВЕ́ДЧАННЕ НАТАРЫЯ́ЛЬНАЕ, учыненне органамі *натарыята* дзеянняў, накіраваных на замацаванне грамадз. правоў і папярэджанне магчымых парушэнняў. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь З.н. належаць факты, якія могуць мець юрыд. вынікі (здзелкі, правільнасць копій дакументаў, выпісак з іх і інш.); засведчанне бясспрэчнага права (напр., права ўласнасці на спадчыну); наданне дакументам выканаўчай сілы (напр., учыненне *выканаўчых надпісаў* на пазыковых і плацежных дакументах); захаванне маёмасці, дакументаў, доказаў. З.н. звычайна робіцца ў памяшканні натарыяльнай канторы, а ў пэўных выпадках (з-за хваробы або інваліднасці кліента) — дома, у бальніцы.

ЗАСВІ́РСКІ ТРО́ІЦКІ КАСЦЁЛ І КЛЯ́ШТАР КАРМЕЛІ́ТАЎ, помнік архітэктуры пач. 18 ст. Пабудаваны ў 1713—14 у в. Засвір (Мядзельскі р-н Мінскай вобл.) у стылі барока. Касцёл — мураваны 1-нефавы храм з 2-вежавым гал. фасадам і паўкруглай алтарнай апсідай, накрыты высокім 2-схільным дахам. Дэкар. аздоба сканцэнтравана на гал. фасадзе: плоскія прамавугольныя і паўцыркульныя нішы, трохвугольны атыкавы франтон і фігурныя завяршэнні вежаў. З Пн да касцёла прылягае мураваны П-падобны ў плане 1-павярховы будынак кляштара, які ўтварае замкнёны ўнутраны двор. У баку ад касцёла стаіць невял. мураваная брама і вежа-званіца. У 1865—1920 касцёл быў перабудаваны пад царкву. У 1994 касцёл і частка кляштара адноўлены. *А.А.Ярашэвіч.*

Засвірскі Троіцкі касцёл і кляштар кармелітаў.

ЗАСЕ́КА, загарода са ссечаных дрэў, паваленых крыж-накрыж верхавінамі ў бок праціўніка. На Русі вядома з 13 ст. Шырока выкарыстоўваліся на межах Рас. дзяржавы ў 16—17 ст. (т. зв. *засечныя межы*). У войнах 20 ст. З. рабілі як перашкоду супраць пяхоты і конніцы праціўніка, звычайна іх умацоўвалі калючым дротам, мінамі і прыкрывалі агнём.

П.І.Засецкі.

ЗАСЕ́ЦКІ Пётр Іванавіч (1899, Саратаўская вобл., Расія — 1941), рускі і бел. спявак (тэнар). Нар. арт. Беларусі (1940). Вучыўся ў Саратаўскай і Данской (Растоў-на-Доне) кансерваторыях. Дэбютаваў у опернай трупе Растова ў 1920. У 1923—24 працаваў у Вял. т-ры ў Маскве і ў опернай студыі пры ім (пад кіраўніцтвам К.*Станіслаўскага*), у 1924—37 у оперных т-рах Ленінграда. У 1938—41 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Яго творчай індывідуальнасці былі ўласцівы ўменне надзяляць

П.Засецкі ў ролі Саўкі.

персанажаў дакладнай псіхал. характарыстыкай, старанная распрацоўка сцэн. малюнка, што найб. яскрава выявілася ў партыях бел. рэпертуару — Саўкі («У пушчах Палесся» А.Багатырова) і Мікіты («Кветка шчасця» А.Туранкова). З інш. партый — Мішук («Ціхі Дон» І.Дзяржынскага), Лыкаў («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Дон Базіліо («Вяселле Фігара» В.А.Моцарта), Сяргей («Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» Дз.Шастаковіча). *Б.С.Смольскі.*

ЗАСЕ́ЧНЫЯ МЕ́ЖЫ (засечныя лініі, засекі), сістэма абарончых умацаванняў на паўд. і паўд.-ўсх. ускраінах Рус. дзяржавы ў 16—17 ст. дзеля аховы ад качэўнікаў. Складаліся з засек, валоў, равоў, частаколаў; выкарыстоўваліся і прыродныя перашкоды (рэкі, яры). Мелі апорныя пункты (астрогі і гарады-крэпасці). Найбольшай была Вялікая З.м. (ад Разані да Тулы). З перамяшчэннем меж Расіі на Пд паступова страцілі сваё значэнне. У 18 ст. вопыт буд-ва З.м. выкарыстоўвалі пры ўзвядзенні пагран. умацаваных ліній.

ЗА́СІМ Мікола (Мікалай Арцёмавіч; 19.11.1908, в. Шані Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. — 19.7.1957), бел. паэт. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1948). За рэв. дзейнасць у 1920—30-я г. ўлады Польшчы неаднойчы арыштоўвалі яго, знявольвалі ў турму. Працаваў у брэсцкай абл. газ. «Зара» (1948—57). З 1926 змяшчаў свае творы ў зах.-бел. прэсе. Першы зб. «Ад шчырага сэрца» (1947). У вершах выяўляў сац. канфлікты ў зах.-бел. вёсцы, паказваў цяжкае жыццё сялянства. Карыстаўся прыёмамі гратэску, пародыі. У вершах ваен. і пасляваен. часу пісаў пра веліч і цяжар нар. вайны ў варожым тыле, радасць мірнай працы.

Тв.: Выбранае. Мн., 1960; Вершы. Мн., 1973.

Літ.: Калеснік У. Лёсам пазнанае. Мн., 1982. *У.А.Калеснік.*

ЗАСІМО́ВІЧ Ігар Сяргеевіч (н. 18.6.1966, Мінск), бел. скульптар. Скончыў Бел. АМ (1994). Працуе ў манум. і станковай скульптуры. Творы вылучаюцца інтэлектуальнай распрацоўкай, імкненнем да асэнсавання рэлігіі і міфалогіі праз філасофію знака і сучасную пластыку. Сярод работ: «Ікар» (1991), «Чарнобыльскае малако» (1992), рэльефы па матывах балад Ф.Шылера і «Лесвіца ў неба» (усе 1993), «Птушкі спяваюць у дождж», помнік 1000-годдзю хрысціянства на Беларусі (абедзве 1994), «Космас», «Дрэва жыцця», «Бласлаўленне. Рука Бога» (усе 1995), «Белая птушка» і «Анёл ахоўнік Беларусі. Прысвячэнне ахвярам Чарнобыля» (абедзве 1996). Адзін з арганізатараў і ўдзельнік плэнеру «Размова з Камянямі» (1996, Мінск).

ЗАСІНЕ́Ц Міхась Мікалаевіч (20.9.1935, в. Мядзведнае Ельскага р-на Гомельскай вобл. — 13.7.1982), бел. самадзейны жывапісец. Засл. работнік культуры Беларусі (1977). Творчай манеры ўласцівы наіўна-рэаліст. трактоўка сюжэтаў, плоскаснасць выявы, дэкаратыўнасць лакальнага колеру: «Вясна», «Маці», «Партызан», «Пах спелага жыта», «Хлеб», «Салдат вярнуўся з фронту», «Вёска будуецца», «На сенакосе», «Сям'я дома», «Печаная бульба», «Дзядулевы дудачкі», «Стары калодзеж», «Дрэва жыцця» (усе 1970-я г.) і інш.

Літ.: Шаура Р.Ф., Красічкава А.І. М.М.Засінец. Мн., 1981.

І.**Засімовіч**. Бласлаўленне. Рука Бога. 1995.

М.**Засінец**. Пах спелага жыта. 1972.

ЗАСІ́НЦЫ, вёска ў Ельскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Ясенец. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 46 км на ПдЗ ад г. Ельск, 223 км ад Гомеля, 32 км ад чыг. ст. Славечна. 343 ж., 129 двароў (1997). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам.

ЗА́СКАР, горны хрыбет на ПнЗ Гімалаяў, у Індыі і Кітаі. Даўж. каля 600 км. Складзены з вапнякоў, пясчанікаў, сланцаў, гранітаў. На выш. каля 6400 м — шырокая, расчлянёная цяснінамі платопадобная паверхня, над якой узвышаюцца асобныя пікі (выш. да 7816 м, г. Нандадэві). Рэльеф альпійскі. Снежнікі, ледавікі. На паўд.-зах. схілах — лясы з гімалайскага кедру (да выш. 4000 м), лугі, на ПнУ — горныя стэпы.

ЗАСЛА́ЎЕ, горад абл. падпарадкавання ў Мінскім р-не, на аўтадарозе Мінск—Маладзечна, на р. Свіслач пры ўпадзенні яе ў Заслаўскае вадасх. За 27 км ад Мінска, чыг. ст. Беларусь на лініі Мінск—Маладзечна, 13,7 тыс. ж. (1997).

Паводле археал. даследаванняў, у 10 ст. на правым беразе р. Свіслач існавала неўмацаванае паселішча *крывічоў*, на процілеглым беразе — пагост (велікакняжацкі адм.-гасп. пункт). Каля 985 на ПдЗ ад іх узнікла гарадзішча «Замэчак», якое на мяжы 11—12 ст. насельніцтва пакінула пасля ўзвядзення дзядзінца на месцы правабярэжнага паселішча. Паводле летапіснага падання, у 10 ст. кіеўскі кн. *Уладзімір Святаславіч* заснаваў тут горад для жонкі кн. полацкай *Рагнеды Рагвалодаўны* і сына *Ізяслава Уладзіміравіча*, у гонар якога названы. Верагодна, з пач. 12 ст. быў цэнтрам удзельнага *Ізяслаўскага княства*. У летапісах З. (Изяславль, Жеславль, Жаславль) упамінаецца пад 1127 у сувязі з паходам на Полацкую зямлю вял. кн. кіеўскага Мсціслава Уладзіміравіча. У сярэдзіне 12 ст. горад і княства сталі аб'ектам барацьбы паміж полацкімі і мінскімі князямі. У канцы 13 ст., верагодна, увайшло ў склад ВКЛ. З 1345 прыватнаўласніцкі горад, належаў кн. Яўнуту, нашчадкі якога зваліся князямі *Заслаўскімі*. У 1539 З. належала Глябовічам, з 1569 у складзе Мінскага пав. Былы дзядзінец у 16 ст. ператвораны ў рэзідэнцыю ўладальнікаў З. (гл. *Заслаўскі замак*). У канцы 16 ст. тут пабудаваны кальвінскі збор. З 1678 горадам валодалі Сапегі, з 1753 — Пшаздзецкія. У канцы 17—18 ст. цэнтр Заслаўскага графства, паводле прывілея 1772 атрымала права на 4 кірмашы ў год. У 2-й пал. 18 — пач. 19 ст. ў З. былі цагельня і суконная ф-ка. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці. У 1873 праз яго пракладзена Лібава-Роменская чыгунка, адкрыта ст. Ізяслаў. У 1904 — 3 тыс. ж., 2 школы, бальніца, аптэка, пошта, 2 царквы (захавалася *Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква*), *Заслаўскі фарны касцёл*. У 1924—59 цэнтр *Заслаўскага раёна* БССР, з 27.9.1938 гар. пасёлак, з 14.8.1985 горад абл. падпарадкавання. З 28.6.1941 да 4.7.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія ў З. і раёне загубілі 3938 чал. У 1977 — 6,5 тыс. чал. Стараж. частка горада, археал. і арх. помнікі ўключаны ў *Заслаўскі гісторыка-культурны запаведнік*.

Працуюць карданажна-паліграф. ф-ка, з-ды драбільна-сартавальны, жалезабетонных вырабаў, асфальтавы, малочны, хлебазавод. Брацкія магілы сав. воінаў, магіла ахвяр фашызму, памятны

крыж у гонар 1000-годдзя хрысціянства на Беларусі. Памятны камень (1985) з нагоды 1000-годдзя горада. Помнікі архітэктуры: Заслаўскі фарны касцёл, Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква. Помнік археалогіі гарадзішча Замэчак. На тэр. З. існаваў *Заслаўскі музей рамёстваў і народных промыслаў.*

ЗАСЛА́ЎЕ, геалагічнае агаленне адкладаў *муравінскага міжледавікоўя* каля г. Заслаўе (Мінскі р-н) у пясчана-жвіровым кар'еры; помнік прыроды рэсп. значэння (з 1984). Адкрыта ў 1979. Ма-

Да арт. **Заслаўе**. Памятны крыж на гарадзішчы Замэчак.

гутнасць азёрна-балотных (торф, суглінак) адкладаў 1,5—2,5 м, якія агаляюцца на працягу больш за 100 м. Залягаюць на флювіягляцыяльных пародах *дняпроўскага зледзянення* і перакрыты лёсападобнымі асадкамі *паазерскага зледзянення*. У адкладзе выяўлены пылок, споры, плады, насенне каля 60 відаў дрэвавых і травяністых раслін (граб, ліпа, клён, ляшчына, зрэдку дуб і елка), больш за 20 відаў рэштак насякомых, якія існавалі ў час оптымуму муравінскага міжледавікоўя. *Г.І.Літвінюк.*

ЗАСЛА́ЎСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, Мінскае мора, Ганалес. У Мінскім р-не, за 10 км на ПнЗ ад Мінска. Створана ў 1956. Рэканструявана і добраўпарадкавана ў 1977. Уваходзіць у *Вілейска-Мінскую водную сістэму.* Пл. 25,6 км^2, даўж. 12 км, найб. шыр. 4,7 км, найб. глыб. 9,1 м. Аб'ём вады 86,1 млн. м^3. Чаша — затопленыя рэчышчы і поймы рэк Свіслач, Вяча, Ратамка, Чарняўка. Месцамі ад вадасховішча дамбамі адсечаны мелкаводдзі, дзе створаны польдэры. Ёсць 3 глыбокаўрэзаныя залівы (самы вял. Ратамскі), 11 астравоў (агульная пл. каля 0,29 км^2). Дно да глыб. 8 м выслана ілам, уздоўж былых рэчышчаў Свіслачы і Вячы — торфам. Берагі спадзістыя, з Пд і З парослыя лесам (з пасадкамі таполі, вярбы, акацыі). Месцамі створаны штучныя пясчаныя пляжы шыр. 20—50 м.

Замярзае ў пач. снеж., лёд (таўшчыня 60—70 см) трымаецца да канца сак. — пач. красавіка. Летам вада прагравацца да 21 °С (у паверхневым слоі). Сяэднегадавая амплітуда вагання ўзроўню перавышае 1 м. Са стварэннем Вілейска-Мінскай воднай сістэмы праточнасць З.в. павялічылася ў 3 разы. Ёсць асобныя ўчасткі, дзе абмен вады вельмі запаволены (на У у Спартакаўскім зал.). Пераважаюць вятры паўн.-зах. напрамку, якія могуць утвараць хвалі выш. 0,7—1,2 м. У выніку хвалевай эрозіі інтэнсіўна размываюцца паўд.-зах. і паўд.-ўсх. берагі. Уздоўж берагоў зарастае, расліннасць (чарот азёрны, трыснёг і аер звычайныя, трапляюцца рдзесты, драсён земнаводны) найб. пашырана ў залівах і вярхоўі. Водзяцца акунь, плотка, шчупак, верхаводка. Выкарыстоўваецца для сезоннага рэгулявання сцёку, абваднення Свіслачы, забеспячэння вадой Мінска. З.в. ўваходзіць у зону адпачынку Мінскага м., на берагах размешчаны міжнар. маладзёжны цэнтр «Юнацтва», прафілакторыі, базы для аматараў-рыбаловаў, спартбазы, дзіцячыя аздараўленчыя лагеры і інш. *Г.С.Жукоўская.*

ЗАСЛА́ЎСКАЯ КА́ФЛЯ, архітэктурна-дэкар. кераміка 15—18 ст., знойдзеная пры археал. раскопках замка і пасада ў г. Заслаўе (Мінскі р-н). Выяўлена каля 2000 цэлых вырабаў і фрагментаў, а таксама рэшткі 11 кафляных печаў 16—17 ст. Паводле тэхналогіі вырабу падзяляецца на групы: гаршковыя кафлі з крыжападобным, цыліндрычным або квадратным вусцем (15 — 1-я пал. 16 ст.); каробчатыя тэракотавыя, мураўленыя і паліхромныя кафлі (16—18 ст.), якія паводле формы і прызначэння былі сценныя (вонкавыя і вуглавыя), паясныя, карнізныя, а таксама калонкі, медальёны і навершы-каронкі для печаў. Вядома больш за 60 відаў і варыянтаў малюнкаў — геральдычныя, партрэтныя, сюжэтныя, з расл. і геам. арнаментамі, пашыранымі на Беларусі і ў Літве. Для З.к. 16 ст. характэрны рэльефныя малюнкі з партрэтнымі выявамі (падобныя кафлі знойдзены пры раскопках Віленскага і Лагойскага замкаў, Троіцкага прадмесця ў Мінску), з выявамі гербаў тагачасных уладароў Заслаўя магнатаў Глябовічаў, Сапегаў, узброеных коннікаў, грыфонаў, ільвоў.

Літ.: З а я ц Ю.А. Заслаўская кафля. Мн., 1990; Я г о ж. Заславль в эпоху феодализма. Мн., 1995. *Ю.А.Заяц.*

ЗАСЛА́ЎСКАЯ КЕРА́МІКА, кухонны, сталовы і тарны посуд 10—18 ст., знойдзены пры археал. раскопках г. Заслаўя

Краявід на **Заслаўскім вадасховішчы**.

Заслаўскае вадасховішча.

і Заслаўскага курганнага могільніка (Мінскі р-н). У 10—14 ст. выраблялі пераважна гаршкі для хатняга ўжытку, якія аздабляліся лінейным рыфленнем, хвалістымі лініямі, зігзагамі, касымі або прамымі насечкамі і інш. У 10 ст. арнаментавалі ўсё тулава гаршка, пазней — частку ад шыйкі да сярэдзіны тулава або толькі плечукі пасудзіны. У некат. вырабах дэкарыравалі толькі венчык. У 16—18 ст. асартымент посуду значна пашырыўся. Выраблялі танкасценны сталовы посуд (макотры, міскі, талеркі, чаркі і інш.) з высакаякаснай глінянай масы. Унутр. паверхню большасці вырабаў паліравалі, знешнюю аздабляліся ангобам; некат. з іх палівалі звонку і знутры. Дэкарыравалі пераважна верхнюю частку вырабаў лінейным ці хвалістым арнаментам, валікамі, зашчыпамі, кветкавым узорам. У канцы 17—18 ст. выраблялі эмаліраваны керамічны посуд. З 18 ст. пашыраны чорназадымлены глянцаваны посуд. Для З.к. 16—18 ст. характэрны стандартызацыя і уніфікацыя форм посуду, блізкасць да *мінскай керамікі*.

Заслаўская кераміка 10—11 ст.

Заслаўская кераміка. Гаршчок 15 ст. (злева); посуд 17—18 ст.

Літ.: Заяц Ю.А. Керамическая посуда Заславля X—XVIII вв. // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Мн., 1993; Яго ж. Заславль в эпоху феодализма. Мн., 1995.

Ю.А.Заяц.

ЗАСЛА́ЎСКАЯ СПАСА-ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. Пабудавана ў г. Заслаўе (Мінскі р-н) як кальвінскі збор, пазней вядома як касцёл св. Міхаіла-архангела, з 1840 Спаса-Праабражэнская царква. Размешчана на высокім узгорку, абкружаным ровам і высокім валам з 4 земляными бастыёнамі па вуглах (гарадзішча «Вал»). Мае рысы стылю рэнесансу. Мураваны 1-нефавы прамавугольны ў плане храм пад высокім 2-схільным дахам; да яго прыбудавана 35-метровая вежа-званіца. Развіты атык, знадворны і ўнутр. партала, гарыз. і верт. чляненні франтона і інш. надаюць невял. будынку манументальнасць. Сцены знадворку дэкараваны пілястрамі і руставанымі вугламі-выступамі. У інтэр'еры самкнутыя скляпенні на падпружных арках пераходзяць у пілястры з прафіляванымі капітэлямі і базамі. Над уваходам драўляныя хоры. Пад царквой 2-часткавая крыпта (пахавальня) з цыліндрычнымі скляпеннямі. Храм перабудоўваўся ў 1678 і 1865, рэстаўрыраваны ў 1968—72. Уваходзіць у *Заслаўскі гісторыка-культурны запаведнік*. У 1978—90 у будынку царквы размяшчаўся *Заслаўскі музей рамёстваў і народных промыслаў*. Храм перададзены праваслаўнай абшчыне.

В.В.Калнін.

Да арт. **Заслаўская кафля**. Кафлі: злева — з выявай конніка, 17 ст.; з выявай герба Сапегаў, 2-я пал. 17 ст.; справа — вуглавая, канец 16 ст.; карнізная, канец 16 ст.

ЗАСЛА́ЎСКІ Яўтен Львовіч (н. 24.5.1920, г. Александрыя Кіраваградскай вобл., Украіна), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1980). Канд. архітэктуры (1961). Скончыў Маскоўскі арх. ін-т (1949). У 1962—72 нам. гал. архітэктара Мінска. У 1973—85 у Бел. НДІІПгорадабудаўніцтва. З 1960 адначасова выкладчык БПА. Асн. работы ў Мінску: будынак Бел. т-ва дружбы і культ. сувязі з замежнымі краінамі (1956), праект планіроўкі і забудовы жылога раёна Чыжоўка (1964, у сааўт.) Адзін з аўтараў генпланаў (1965, 1980, 1983) і праекта дэталёвай планіроўкі і забудовы цэнтра Мінска (1974), раённай планіроўкі Мінскай, Гомельскай, Брэсцкай, Магілёўскай абл. (1977), схемы рассялення Беларусі (1981). Аўтар прац па архітэктуры і горадабудаўніцтве.

Тв.: Минск: Послевоенный опыт реконструкции и развития. М., 1966 (у сааўт.); Что такое архитектура. Мн., 1978; Градостроительство Белоруссии. Мн., 1988 (у сааўт.); Общественные центры городских населенных мест БССР: (Опыт формирования, пробл. и направления развития). Мн., 1991.

Млын 1910 на тэрыторыі **Заслаўскага гісторыка-культурнага запаведніка**.

ЗАСЛА́ЎСКІ ГІСТО́РЫКА-КУЛЬТУ́РНЫ ЗАПАВЕ́ДНІК, Дзяржаўны гісторыка-культурны запаведнік «Заслаўе». Створаны ў 1986 у г. Заслаўе Мінскага р-на на базе гіст.-археал. запаведніка (засн. ў 1967). Уключае *Заслаўскі замак*, гарадзішча «Вал», «Замэчак» 10—11 ст., *заслаўскія курганныя могільнікі*, *Заслаўскі фарны касцёл*, рэшткі сядзібы 17—19 ст. На тэр. запаведніка музеі «Млын», «Хата завознікаў», «Кузня», «Свіран» (усе пач. 20 ст.), музейна-выставачны комплекс, у якім размешчаны выстаўкі муз. інструментаў (177 экз.), дываноў «Мара аб Заслаўі», габеленаў. Пл. запаведніка 1,13 км^2, пл. экспазіцыі 375 м^2, 9,4 тыс. экспанатаў (1997), у т.л. 256 твораў жывапісу, 196 — графікі, 1,81 тыс. прадметаў этнаграфіі, каля 3,9 тыс. археалогіі, 612 тамоў друк. выданняў. У 1978—90 на тэр. запаведніка дзейнічаў музей рамёстваў і нар. промыслаў (размяшчаўся ў будынку *Заслаўскай Спаса-Праабражэнскай царквы* 16 ст.). Удзельнік міжнар. руху «За новую музеялогію».

А.М.Каўбаска.

ЗАСЛА́ЎСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 11—18 ст. у г. *Заслаўе* Мінскай вобл. Размяшчаўся на беразе р. Свіслач. Меў фор-

му прамавугольніка (пл. каля 1,5 га). Першапачатковыя ўмацаванні пабудаваны на рубяжы 11—12 ст. Найб. значныя перабудовы праводзіліся ў 2-й пал. 13, у 14, 16 і, магчыма, у пач. 17 ст. Зафіксаваны сляды аднаўленчых работ пасля нападаў на горад у 1127 і 1434. У выніку ўсіх перабудоў вышыня вала да канца 16 ст. дасягала 8—9,5 м. Па вуглах замка размяшчаліся 4 бастыёны, 5-ы, паўкруглай формы, захаваўся каля паўд. курціны. Ад горада замак аддзяляўся шырокім ровам. З канца 16 ст. тэр. вакол замка была заліта вадой штучнага возера, утворанага з дапамогай плацін на рэках Свіслач і Чарніца, і замак ператварыўся ва ўмацаванне астраўнога тыпу. З 16 ст. тут размяшчалася рэзідэнцыя ўладальнікаў горада. У 1676 зах. палова замка перададзена Заслаўскаму кляштару дамініканцаў. У 18 ст. З.з. страціў сваё ваен. значэнне.

Ю.А.Заяц.

Заслаўскі замак. Рэканструкцыя В.Сташчанюка.

ЗАСЛА́ЎСКІ КЛЯ́ШТАР ДАМІНІКА́НЦАЎ. Існаваў у Заслаўі ў 1676—1832. Засн. тагачаснымі ўладальнікамі горада Казімірам і Крыстынаю (з Глябовічаў) Сапегамі. У 1678 асвячоны віленскім біскупам. Размяшчаўся на замчышчы пры касцёле архангела Міхаіла, перабудаваным з кальвінскага збору. Пабудаваны ў 1772 корпус жылога будынка з часанага дрэва быў 2-павярховы, на каменным падмурку, франтонам звернуты на У. Б-ка ў 1818 мела 422 тамы. Пасля скасавання кляштара касцёл некат. час быў парафіяльным, у 1840 асвячоны як *Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква.*

А.А.Ярашэвіч.

ЗАСЛА́ЎСКІ МУЗЕ́Й РАМЁСТВАЎ І НАРО́ДНЫХ ПРО́МЫСЛАЎ. Існаваў у 1978—90 у г. Заслаўе Мінскага р-на як філіял Дзярж. музея Беларусі. З 1986 уваходзіў у склад *Заслаўскага гісторыка-культурнага запаведніка*, размяшчаўся ў будынку *Заслаўскай Спаса-Праабражэнскай царквы.* Меў 2 выставачныя залы (пл. 346,5 м^2). Матэрыялы адной залы знаёмілі з гісторыяй Беларусі і гарадоў: карта Беларусі, выявы стараж. гербаў бел. гарадоў, якія мелі магдэбургскае права. У экспазіцыі другой залы было больш за 900 твораў дэкар.-прыкладнога мастацтва і нар. рамёстваў 10 — пач. 20 ст., у т.л. знойдзеныя пры археал. раскопках. Сярод экспанатаў наканечнікі стрэл 10—12 ст., прадметы побыту з рогу і косці 10—17 ст., кап'ё 11 ст., ганчарны (12—13 ст.) і шкляны (18—20 ст.) посуд, упрыгожанні 10—13 ст. з металу, шкла, сердаліку (скроневыя кольцы, шыйныя грыўні, бранзалеты, пацеркі, пярсцёнкі, падвескі і інш.), паліхромная кафля 16—17 ст., дэталі зброі 16—17 ст., вырабы бел. злотнікаў (пацір 16 ст., напрастольны крыж 1625 з Навагрудка), разныя царскія вароты 18 ст. з Давыд-Гарадоцкай Георгіеўскай царквы, скульпт. выявы святых з Віцебскай і Гродзенскай абл., слуцкія паясы, неглюбскія ручнікі і інш. Расфарміраваны ў сувязі з перадачай храма правасл. абшчыне. Большая частка экспанатаў захоўваецца ў фондах Нац. маст. музея Беларусі.

А.А.Гурбо.

ЗАСЛА́ЎСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка БССР у 1924—59. Утвораны 17.7.1924 у складзе Мінскай акругі. Цэнтр — г.п. *Заслаўе.* У 1925 пл. 834 км^2, 34 819 ж., 444 нас. пункты. Падзяляўся на 12 сельсаветаў, на 1.1.1941 — 10. З 20.2.1938 у Мінскай вобл. 8.8.1959 раён скасаваны, яго тэр. далучана да Мінскага р-на.

ЗАСЛА́ЎСКІ ФА́РНЫ КАСЦЁЛ, касцёл Марыі, помнік архітэктуры стылю барока. Пабудаваны ў 1774 у цэнтры г. Заслаўе (Мінскі р-н) на месцы драўлянага храма. Мураваны 1-нефавы прамавугольны ў плане асн. аб'ём з паўцыркульнай апсідай і 2 бакавымі *сакрысціямі.* Гал. фасад, аздоблены пілястрамі і круглымі блендамі, завяршаўся франтонам. У 1868 касцёл перабудаваны пад царкву Раства Багародзіцы. Быў разбураны франтон, у цэнтры гал. фасада пабудавана чацверыковая вежа-званіца, над гал. аб'ёмам узведзены вял. купал на светлавым барабане. Сцены на 2 узроўнях прарэзаны вял. аконнымі праёмамі з паўцыркульным завяршэннем. Да гал. ўвахода вядзе мураваная лесвіца з тэрасай. Інтэр'ер зальны, сцены ўпрыгожаны пілястрамі карынфскага ордэра. Дэкар. афармленне інтэр'ера не захавалася. З 1989 касцёл на рэстаўрацыі.

ЗАСЛА́ЎСКІЯ, Жаслаўскія, Яўнуцьевічы, княжацкі род у ВКЛ. Паходзілі ад вял. кн. ВКЛ *Яўнута*, які ў 1345 быў скінуты братамі Альгердам і Кейстутам і атрымаў ад іх г. Заслаўе (адсюль прозвішча). Найб. вядомыя:

Іван Юр'евіч (? — 1499?), праўнук Яўнута, намеснік мінскі ў 1468—73, віцебскі (каля 1484). Меў вотчыны на Смаленшчыне. Міхаіл Іванавіч (каля 1460—1529), сын Івана Юр'евіча, намеснік віцебскі ў 1492—95. У 1499 атрымаў у вотчыну частку Мсціслаўскага княства, тытулаваўся князем Мсціслаўскім. Уваходзіў у склад Рады ВКЛ і меў статус удзельнага князя. У 1526 падараваў Мсціслаўскае княства вял. князю ВКЛ. Ад яго сына Фёдара (каля 1500—40) пайшоў род князёў Мсціслаўскіх у Расіі. Багдан

Заслаўскі фарны касцёл. Здымак пач. 20 ст.

Заслаўскі фарны касцёл. Сучасны выгляд.

Іванавіч (каля 1465—1530), намеснік мінскі з 1499. Фёдар Іванавіч (каля 1470—1539?), намеснік віцебскі ў 1492, бранскі ў 1494—99, аршанскі і аболецкі з 1501. Адзіны з братоў валодаў Заслаўем. *В.Л.Насевіч.*

ЗАСЛА́ЎСКІЯ КУРГА́ННЫЯ МО́ГІЛЬНІКІ, група археал. помнікаў на тэр. і ў ваколіцах г. Заслаўе Мінскага р-на. Захаваліся рэшткі 8 могільнікаў. Даследаваны 142 курганы (большасць 2-й пал. 10 — 1-й пал. 11 ст.), належаць пераважна *крывічам*, таксама *дрыгавічам*, невял. колькасць інш. усх.-слав. плямёнам, фіна-уграм і балтам. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце, зрэдку ў падкурганных ямах і насыпе, у 5 курганах — трупаспаленне. Пахавальны інвентар — зброя (коп'і, сулицы, сякеры, булава), упрыгожанні (скроневыя кольцы, шыйныя грыўні, каралі, бранзалеты), рэчы хатняга ўжытку (кераміка, нажы, грабяні і інш.), манеты.

К.С.**Заслонаў**.

ЗАСЛО́НА стратэгічная, аператыўнае аб'яднанне войск. атрадаў Сав. Расіі ў 1918. Уведзена Вышэйшым ваен. саветам у сак. 1918 для абароны дэмаркацыйнай лініі, устаноўленай паводле *Брэсцкага міру 1918* (ад Фінскага зал. да Курска). Падзялялася на ўчасткі атрадаў. Атрады, што займалі лінію на тэр. Беларусі, уваходзілі ў *Заходні ўчастак атрадаў заслоны*. У канцы 1918 — пач. 1919 участкі атрадаў сталі базай для ўтварэння армій і франтоў.

ЗАСЛО́НАЎ Канстанцін Сяргеевіч (партыз. мянушка Дзядзька Косця; 7.1.1910, г. Асташкаў Цвярской вобл., Расія — 14.11.1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў парт. падполля і партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў прафес.-тэхн. школу ў Вял. Луках (1930). З 1939 нач. паравознага дэпо ст. Орша. У вер. 1941 у Маскве сфарміраваў з чыгуначнікаў партыз. атрад, у кастр. перайшоў з ім лінію фронту, уладкаваўся на працу ў Аршанскае дэпо. Стварыў і ўзначаліў некалькі дыверс. груп, якія разам з падп. групамі *Аршанскага патрыятычнага падполля* паралізавалі работу чыг. вузла. З лют. 1942 камандзір партыз. атрада, з ліп. 1942 — брыгады. Арганізоўваў дыверсіі на чыгункі, узначальваў баявыя дзеянні супраць ворага на тэр. Аршанскага, Багушэўскага, Лёзненскага, Сенненскага і інш. раёнаў. Загінуў у час *Купавацкага бою 1942*. У Оршы створаны мемар. музей З., у Оршы, Сянно і на месцы гібелі З. пастаўлены помнікі.

ЗАСЛО́НАЎ Раман Леанідавіч (н. 27.8.1962, Мінск), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1985). Творчасці ўласцівы выразная індывідуальнасць маст. почырку, разнапланавасць кірункаў, метафарычнасць, багацце і згарманізаванасць графічных, фармальных і каларыстычных эксперыментаў. Сярод работ: «Лясная глуш» (1980), «Плывуць аблокі» (1984), «Вялікія паляўнічыя», «Жанчыны павольна рухаюцца па цёмным лесе» (абедзве 1990), «Вяртанне з кірмашу», «Чырвоная сукенка» (абедзве 1993), «Настальгія», «Летуценні» (абедзве 1996), «Пасьянс» (1997, 1-я прэмія міжнар. Асенняга салона ў Парыжы).

ЗАСЛО́НАЎКА, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл., на р. Адроў. Цэнтр Забалацкага с/с і саўгаса. За 9 км на З ад горада і чыг. ст. Орша, 89 км ад Віцебска. 780 ж., 225 двароў (1997). Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ АРТЫ́СТ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. артыстам, рэжысёрам, балетмайстрам, дырыжорам, хормайстрам, муз. выканаўцам, што працуюць у сферы мастацтва 10 і больш гадоў, артыстам балета з улікам спецыфікі іх жанру, якія працуюць 5 і больш гадоў і стварылі высокамаст. вобразы, спектаклі, кінафільмы, тэлеспектаклі, тэлефільмы, канцэртныя, эстр., цыркавыя праграмы, муз., тэлевізійныя і радыётворы, што атрымалі грамадскае прызнанне. Званне засл. арт. Беларускай ССР устаноўлена 16.4.1928 і прысвойвалася СНК БССР, з 1938 — Прэзідыумам Вярх. Савета БССР; званне засл. арт. Рэспублікі Беларусь з 1991 прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь, з 1995 згодна з законам ад 13.4.1995 прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь

1928. Е.А. Міровіч. **1931**. У.М.Крыловіч. **1933**. У.У.Кумельскі, У.І.Уладамірскі (Малейка). **1934**. Л.М.Літвінаў. **1935**. А.А.Згіроўскі, А.К.Ільінскі, А.М.Кальцаты, Р.М.Свярдлова, А.М.Файнцымер. **1936**. Л.П.Александроўская, У.І.Дзядзюшка. **1938**. Л.Ф.Аляксеева, Дз.А.Арлоў, Ю.С.Арончык, С.С.Бірыла, А.Л.Бяссмертны, З.А.Васільева, В.У.Галіна, Г.П.Глебаў, М.І.Дзянісаў, І.Ф.Ждановіч, М.П.Звездачотаў, М.А.Зораў (Штоклянд), Р.М.Кашэльнікава, П.С.Малчанаў, Р.В.Млодак, І.А.Мурамцаў, А.В.Нікалаева, Б.В.Платонаў, Е.Г.Рахленка, Л.І.Ржэцкая, М.Б.Сокал, Ц.М.Сяргейчык, А.Я.Трэпель. **1939**. І.М.Балоцін, Г.Ю.Грыгоніс. **1940**. М.Я.Аблаў, Г.Б.Абуховіч, А.Н.Амітон, А.Дз.Арсенка, А.В.Астахаў, А.В.Багатыроў, А.А.Бельскі, М.А.Бергер, Р.П.Блюмберг, С.Ф.Бычкоў, М.С.Бялінская, В.Я.Галаўчынер, К.Я.Галяйзоўскі, С.З.Друкер, П.І.Засецкі, П.С.Златагораў, П.І.Іваноў, В.В.Каліноўскі, А.К.Клумаў, М.Я.Крошнер, В.П.Лапін, І.І.Любан, В.М.Малькова, К.Э.Міронава, М.М.Моін, І.А.Мусін, С.У.Палонскі, В.М.Пола, С.У.Скальскі, І.Б.Шаціла, А.Р.Шэлег. **1942**. А.Ф.Усачоў. **1943**. К.М.Саннікаў. **1944**. М.І.Аладаў, І.І.Жыновіч, Б.К.Кудраўцаў, Л.А.Маркевіч, М.А.Міцкевіч, П.В.Нікандраў, А.П.Радзялоўская, Я.С.Рамановіч, Э.І.Рознер, С.М.Станюта, А.М.Трус, В.І.Чэмберг, А.Л.Шапс, У.М.Шахрай. **1945**. С.В.Дрэчын, Б.А.Пакроўскі. **1946**. Э.П.Шапко, Л.П.Шынко, Б.З.Янпольскі. **1947**. А.Ф.Кістаў. **1949**. В.Ф.Валчанецкая,

Р.**Заслонаў**. Летуценні. 1996.

Г.А.Волкаў, М.Дз.Ворвулеў, Я.К.Глебаўская, М.А.Кавязін, Т.Г.Караваева, Г.В.Качаткова, Я.М.Палосін, В.В.Пацехін, П.А.Пекур, І.П.Сайкоў, М.М.Сярдобаў, С.Л.Талкачоў. **1951**. Н.І.Гусельнікава, М.А.Зюванаў. **1952**. А.І.Лагоўская, Ф.І.Шмакаў. **1953**. А.А.Бараноўскі, Л.С.Драздова, Я.А.Карнавухаў, А.М.Савіна, З.Ф.Стома. **1954**. Р.В.Асіпенка, З.І.Браварская, Л.Ф.Бражнік, У.М.Глазаў, Я.М.Глінскіх, П.Ф.Дзянісаў, З.І.Канапелька, П.С.Крук, В.І.Крыкава, К.К.Кудрашова, М.А.Лазараў, І.К.Лакштанава, К.А.Мулер, Т.М.Ніжнікава, Г.К.Някрасаў, Л.М.Ражанава, В.Ф.Сербін, Т.І.Шымко. **1955**. М.П.Абрамаў, У.У.Алоўнікаў, Т.Н.Аляксеева, В.А.Белы, А.І.Білібін, В.М.Браянкоў, С.С.Бульчык, К.І.Бянеўскі, Л.У.Голуб, Н.С.Давыдзенка, А.М.Данілоўіч, Т.П.Заранок, В.С.Захарава, С.П.Іванова, Т.Ф.Канавалава, В.А.Краўцоў, М.І.Кузьменка, Б.П.Макараў, А.М.Маралёў, П.А.Маркін, Г.Р.Мартынаў, Л.П.Маціcава, Я.Ц.Мілаеў, В.П.Міронаў, Н.Ф.Младзінская, С.М.Навіцкі, Т.М.Пастуніна, І.А.Ражба, Ю.І.Сляпнёў, Ю.М.Стальмакоў, М.П.Тэадаровіч, Б.В.Уксусаў, М.І.Цурбакоў, Г.І.Цэпава, А.І.Шах-Парон, А.Б.Шкапскі, Х.І.Шмелькін, М.Р.Шуманскі, В.Дз.Шутаў, М.К.Шэхаў, М.М.Яроменка. **1956**. М.Я.Астанкава, Г.П.Глінаецкі, М.У.Кавязіна. **1957**. А.П.Асторына, Л.І.Галушкіна, Я.М.Кімберг, І.С.Папоў. **1959**. А.А.Астрамецкі, Ю.С.Гальперына, А.М.Генералаў, В.І.Глушакоў, В.П.Дубровскі, В.Р.Кабатнікава, А.І.Клімава, І.А.Матусевіч, А.П.Раеўскі, М.Л.Співак, М.Л.Федароўскі, В.І.Юневіч, С.І.Яворскі. **1961**. А.С.Аркадзьеў, С.П.Асновіч, Л.А.Гамуліна-Цурбакова, У.М.Говар-Бандарэнка, В.К.Давыдаў, С.Ц.Давыдаў, А.А.Карзянкова, Б.З.Карпілава (Разенблат), П.М.Кірыльчанка, Г.С.Лаўроў, А.П.Майзлер, Г.К.Макарава, У.Я.Мартынаў, І.М.Савельева, Т.М.Скарута, Т.В.Трушына, Ю.І.Уласаў, М.М.Шышкін, Л.С.Яцэнкіна-Весніна. **1962**. Б.В.Нікольскі, Г.К.Панкрат. **1963**. І.С.Абраміс, М.У.Адамейка, З.І.Бабій, А.М.Вязаў, Л.Д.Гарэлік, Р.В.Дзідзенка, А.Г.Каменская, А.С.Каменскі, А.К.Лотінаў, А.С.Наважылаў, А.М.Самараў, Г.Д.Светашаў, Ю.У.Сідараў, В.П.Тарасаў, Н.А.Ткачэнка, С.Ф.Хацкевіч, В.М.Чарнабаеў, М.І.Шошчыц, Р.І.Янкоўскі, С.І.Яўдошанка. **1964**. Л.Р.Ганестава, В.Дз.Ганчарэнка, В.Ф.Грачынскі, І.Дз.Дзідзічэнка, П.В.Дружына, Р.Е.Красоўская, Н.С.Нікеева, Н.Б.Парошына, Н.А.Ражнова, А.М.Саўчанка, Ю.П.Ужанцаў, Р.Я.Яўраеў. **1965**. Л.Я.Стасевіч. **1966**. В.В.Антонава, М.А.Апанасенка, Г.В.Аўдзеенка, К.М.Верамейчык, П.П.Дубашынскі, В.В.Катаеў, А.А.Ляляўскі, М.І.Маліноўскі, З.І.Малчанава, Г.П.Маркіна, М.П.Маркоўская, В.В.Мароза-ва, Т.В.Міянсарава, Б.М.Пянчук, Л.І.Сторажава, І.А.Цюрын, С.П.Юркевіч, С.С.Яскевіч. **1967**. С.І.Аляксандраў, В.А.Бурковіч, В.Л.Вуячыч, В.Ф.Гур'еў, М.Г.Захарэвіч, Дз.І.Зубрыч, Дз.І.Іванова, У.А.Калашнікаў, Н.А.Карнеева, Г.Я.Клачко, Б.М.Левін, В.С.Окалаў, М.У.Пятрова, І.І.Раеўскі, А.А.Рачоў, А.А.Рудакоў, Б.Г.Скабло, У.І.Слаўкоў, М.А.Табашнікаў (Зорын), Г.Б.Токараў, П.П.Філіпаў, Р.С.Філіпаў, Н.Р.Фядзяева, Л.Я.Цімафеева, Л.С.Чахоўскі, Л.І.Юзафовіч, А.А.Яфрэменка. **1968**. Г.А.Арлова, А.І.Бірычэўскі, В.В.Воінкаў, Г.М.Гарбук, Л.М.Давідовіч, С.П.Данілюк, Ф.М.Іваноў, У.М.Кавальчук, В.Л.Кірычэнка, У.А.Куляшоў, Р.Ф.Маленчанка, Б.А.Масумян, М.П.Пало, А.В.Рынковіч, Ю.В.Смірноў, Л.П.Сцяфанава, Г.Л.Храмушын, А.А.Цароў, П.Р.Чабаненка, В.Р.Шаўкалюк, Т.Р.Шашкіна, І.Л.Эйдэльман (Курган), А.М.Яўдошанка. **1969**. Б.В.Барысёнак, В.Ц.Лебедзеў, У.П.Уласаў. **1970**. П.В.Кармунін, Т.А.Кокштыс, І.П.Лакштанаў, Э.Л.Міцуль, Я.М.Паўловіч, Г.П.Рыжкова, Г.С.Талкачова, Б.У.Уладамірскі, Я.П.Яравой. **1971**. Л.Г.Бржазоўская, В.Ф.Бруй-Шуляк, Г.У.Пятровіч, В.Г.Прышчапёнак, В.У.Саркісьян, А.А.Сухін, Ю.А.Траян. **1972**. Ю.А.Агееў, Т.І.Апёк, Г.С.Аўсяннікаў, Г.С.Дубаў, М.П.Красоўскі, А.Л.Мілаванаў, К.Ф.Старыкава, І.С.Шыкунова. **1973**. В.С.Белахвосцік, З.А.Бандарэнка, Н.В.Гайда, У.Г.Мулявін, Б.І.Райскі, Л.Р.Румянцава, А.С.Самарадаў, Ю.Ф.Ступакоў, В.Р.Фаменка, В.П.Шутава. **1974**. Л.У.Былінская, Т.Р.Губко (Раеўская), В.А.Кучынскі. **1975**. Н.З.Багуслаўская, Н.Ф.Калаптур, Г.А.Лебедзева, П.І.Масцераў, А.Ф.Мельдзюкова, Н.М.Паўлава, А.Р.Рудкоўскі, Г.Ф.Сідзельнікава, Л.А.Смялкоўскі, Т.П.Сцяпанава, Л.М.Федчанка, Т.А.Шафранава, Н.М.Ясева. **1976**. С.А.Акружная, С.І.Гулевіч, В.Ф.Гусеў, Я.І.Дашкоў, У.У.Кудрэвіч, З.В.Курдзянок, К.І.Перапяліца, Л.І.Пісарава, В.А.Смачнеў, Б.І.Сяўко, Л.М.Усанава, М.П.Цішачкін. **1977**. А.А.Бялоў, А.А.Дзедзік, Л.С.Дзяменцьева, Н.В.Караткевіч, В.З.Краўчанка, А.В.Кузняцоў, У.А.Мішчанчук, В.М.Філатаў. **1978**. Ф.Я.Балабайка, В.І.Гаявая, Л.К.Каспорская. **1979**. Л.Л.Барткевіч, А.А.Варанецкі, У.П.Грамовіч, Ф.Ф.Гулевіч, А.С.Дзямешка, М.А.Зданевіч, У.І.Іваноўскі, А.Я.Кашапараў, У.Л.Місевіч, С.І.Пясцехін, М.У.Пятроў, Л.М.Сінельнікава, Л.Б.Тышко, Я.П.Шыпіла. **1980**. У.У.Будкевіч, В.В.Волкаў, М.Ф.Галкоўскі, Ю.В.Гершовіч, Я.П.Гладкоў, А.П.Дзянісаў, Я.А.Еўдакімаў, М.М.Зінкевіч, У.У.Іваноў, Б.Дз.Казанцаў, У.Ц.Камкоў, А.Ф.Кашкер, І.А.Краснадубскі, А.Дз.Курмакін, Ю.В.Лазоўскі, А.С.Падгайскі, А.К.Памазан, У.М.Рагаўцоў, Дз.В.Рудзько, Ю.У.Труханаў, В.В.Фралоў, Ю.І.Шэфер. **1981**. Б.С.Чудакоў. **1982**. З.В.Асмалоўская, У.В.Гасцохін, М.А.Дружына, В.М.Клебановіч, К.І.Лосеў, В.М.Мазур, Л.П.Максімава, Я.Ф.Пятроў, Л.І.Рабушка, В.П.Раінчык, В.І.Скорабагатаў, А.Л.Ткачонак, Г.С.Халшчанкова (Радзько), А.А.Шпянёў, У.М.Яркоў, У.М.Яскевіч. **1983**. Г.В.Асмалоўская, Ю.Г.Бастрыкаў, А.М.Кашталапаў, Л.Я.Колас, Б.У.Нічкоў, М.І.Сеўрукоў, А.А.Смалянскі, У.С.Экнадыёсаў. **1984**. М.Н.Баркоўскі, Н.І.Казлова, В.Ф.Карэлікава, Т.Р.Мархель, В.Ц.Петрачкова, Т.М.Яршова. **1985**. І.У.Алоўнікаў, В.В.Казак (Пархоменка), Л.Л.Кудзеля, В.М.Сарока. **1986**. Л.І.Трушко, А.І.Ярмоленка. **1987**. М.А.Гулегіна, Г.І.Забара, В.А.Купрыяненка, С.Л.Лясун, Ф.М.Севасцьянаў, С.П.Сяргеенка, М.Р.Штэйн. **1988**. В.М.Бандарэнка, Р.Я.Белацаркоўскі, І.А.Душкевіч, М.Г.Емяльянаў, Г.В.Казлоў, І.А.Кідуль, Б.І.Кір'янаў, В.М.Крыловіч, А.А.Луцэнка-Гайдуліс, Р.І.Харык, У.І.Шэлестаў. **1989**. З.П.Зубкова, Я.А.Кавалёва, М.Я.Ліпчык, П.А.Навасад, А.С.Падабед, А.А.Рамашкевіч, Ю.А.Раўкуць, С.І.Суседчык, У.П.Ткачэнка, Ю.М.Чарнецкі. **1990**. Г.А.Белавусава, Ф.С.Варанецкі, Ю.М.Васілеўскі, Л.В.Гарбунова, А.Л.Гарэлік, Н.А.Дадышкіліяні, В.С.Дайнэка, М.А.Жылюк, Г.А.Карант, А.А.Карзянкоў, Н.Я.Кастэнка, Ю.Ф.Корсак, Л.К.Лаўрыновіч, І.А.Пеня, Т.С.Пячынская, П.В.Рыдзігер, С.А.Салодкая, У.І.Салодкі, Ю.А.Сарычаў, Л.С.Талкачова, Т.Р.Шаметавец, В.П.Шчарыца. **1991**. Н.Я.Аляксандрава, М.А.Багданаў, Б.В.Баеў, М.І.Берсан, Н.Р.Васільева-Качаткова, Л.М.Веяўнік, В.І.Кавалерава, Г.Р.Маляўскі, А.І.Марцынюк, Я.К.Паплаўская, В.В.Смірноў, І.М.Тамашэвіч, А.Р.Ціхановіч, В.П.Ціхевіч, А.С.Цялькова, М.М.Чырык. **1992**. Н.Н.Бранковіч, У.І.Вепрык, Г.І.Гарбук (Яроменка), Ю.М.Гільдзюк, М.І.Гулінская, М.І.Засімовіч, Р.В.Ігнацьеў, А.М.Казакоў, С.А.Кашталапава, У.П.Перлін, М.М.Скорыкаў, Г.А.Трушко, У.Л.Хмурыч, І.М.Шуміліна, В.Р.Шытаў, Ч.І.Юшкевіч. **1994**. Н.Х.Галеева, Н.А.Губская, В.М.Захараў, І.В.Лапцінскі, У.М.Праваліпскі, Н.А.Руднева, У.П.Тарашкевіч, К.Ю.Фурман. **1995**. Э.М.Гарачы, Л.П.Івашкоў, Ю.В.Паўлішын, А.Б.Цівуноў. **1996**. А.І.Лабанок, Г.В.Шкуратаў. **1997**. З.В.Белахвосцік, Л.А.Волкава, Л.М.Горцава, А.А.Жук, А.М.Ісаеў, В.С.Манаеў, Я.П.Навуменка, Л.У.Нікольскі, Г.І.Паўлянок, Н.М.Раманская, У.М.Ткачэнка, Л.А.Улашчанка, А.У.Фёдараў, Н.Д.Чараднічэнка, В.І.Чэпелеў. **1998**. С.Я.Анцішын, С.У.Курыленка, Л.М.Некрашэвіч.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ АРХІТЭ́КТАР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. архітэктарам, якія працуюць у галіне архітэктуры 15 і больш гадоў, асабліва вызначыліся ў развіцці бел. архітэктуры, выявілі выдатную творчую дзейнасць у галіне горадабудаўніцтва, у стварэнні грамадз., прамысл., сельскіх арх. комплексаў, будынкаў і збудаванняў, што атрымалі ўсенароднае прызнанне, у рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 14.6.1968 існавала званне засл.

архітэктар Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя архітэктары Рэспублікі Беларусь

1969. В.М.Аладаў, М.І.Бакланаў, С.Б. Баткоўскі, Г.М.Бенядзіктаў, В.І.Гусеў, В.Б.Ладыгіна, М.Н.Ліўшыц, Г.А.Парсаданаў, Ю.В.Шпіт. **1970**. А.Ю.Данілава, П.С.Рудзік. **1971**. З.М.Леўчанка. **1973**. І.І.Боўт, С.С.Мусінскі, Л.М.Пагарэлаў, Г.В.Сысоеў. **1974**. Н.А.Э.Шпігельман. **1976**. Г.А.Бяганская, Ю.П.Грыгор'еў, Л.М.Тамкоў, А.Ф.Ткачук. **1978**. В.М. Волчак. **1979**. Ю.М.Градаў, У.Э.Сакалоўскі, В.П.Шыльнікоўская. **1980**. В.І. Анікін, Я.Л.Заслаўскі, А.П.Калініньш. **1982**. Я.Л.Ліневіч. **1983**. В.М.Малышаў. **1984**. Б.М.Ларчанка. **1985**. В.Н.Емяльянаў, Я.К.Казлоў, Л.В.Маскалевіч, Ю.Ф. Патапаў, Р.А.Шылай. **1988**. Я.К.Дзятлаў, У.М.Еўдакімаў, Л.М.Левін. **1989**. С.І.Пеўны. **1990**. А.А.Беразоўскі, І.М. Мазнічка. **1991**. В.С.Бялянкін, А.А.Воінаў, Э.М.Гальдштэйн, А.У.Жалдакоў, Э.П.Левіна, С.Б.Неўмывакін, Н.М.Нядзелька, М.М.Пірагоў, А.А.Сабалеўскі. **1997**. І.І.Некрашэвіч. **1998**. У.Р.Ісачанка.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ БУДАЎНІ́К РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. работнікам будаўніцтва і будаўнічай індустрыі, якія працуюць у будаўнічых, н.-д., праектных, праектна-пошукавых, мантажных і інш. арг-цыях 15 і больш гадоў, за заслугі ў вытворчай дзейнасці, распрацоўцы і ўкараненні прагрэсіўных праектаў і тэхналогій, перадавога вопыту арганізацыі, механізацыі і аўтаматызацыі працы, дасягненне высокай эфектыўнасці вытворчасці і якасці буд.-мантажных работ. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1960 існавала ганаровае званне заслужаны будаўнік Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя будаўнікі Рэспублікі Беларусь

1960. У.Ц.Атрошчанка, Е.С.Галаўнёва, С.А.Грыгор'еў, В.Ф.Дзем'янюк, А.А. Дзігілевіч, І.А.Доўнар, А.А.Жалняровіч, Р.С.Забалееў-Ізотаў, Я.Ф.Казлоўская, З.А.Караткевіч, І.К.Колычаў, А.С.Лапуноў, М.Х.Ломскі, У.П.Маскалёў, В.І.Свецікаў, В.А.Слепухоў, П.М.Сцяблюк, Ц.К.Фандо, Я.Ф.Філічонак, П.Г. Фядоценка, І.Э.Шаблоўскі, В.Ш.Шайхлісманаў, С.І.Ярашэвіч. **1961**. А.В.Астроўскі, У.М.Вараксін, В.К.Гаравой, А.М.Громаў, М.К.Гуд, І.К.Дуброўскі, Г.У.Заборскі, А.Ц.Маграшоў, В.Дз.Макавец, Т.М.Макараў, Л.А.Новікава, І.А.Паддубіцкі, М.І.Паўлаў, М.М.Сівухін, М.П.Тарасенка, І.Дз. Шлапакоў. **1962**. Р.А.Абразцова, А.С. Абухоўскі, Я.І.Анісімаў, Ф.Ф.Арцёменка, С.С. Атаеў, П.Л.Бабак, А.Г.Базаеў, С.С.Батурын, М.Н.Богуш, К.А.Бондараў, Л.С. Булах, М.Л.Вараб'ёў, І.П.Ведзмедзь, А.П.Воінаў, М.С.Галуза, Г.М.Глезер, І.І.Грыгаровіч, Л.А.Жук, І.М.Жыжаль, У.В.Казюля, А.Н.Каралёў, У.А.Кароль, М.В.Кашчэеў, Н.І.Лісавец, К.А.Магілеўскі, А.С.Мазейка, В.А.Мароз, У.Г. Міхайлаў, А.Ф.Мураўскі, Л.С.Паперна, Г.П.Паўлоўскі, В.Л.Пятніцкі, І.М.Рабцаў, Р.І.Рубанаў, М.А.Свірскі, М.П.Семянцоў, Г.І.Страіцелеў, В.А.Талмачоў, С.М.Траногін, В.Л.Трэйда, В.М.Фамін, М.А.Хомчанка, В.Я.Цвяркун, П.П.Цімашэнка, К.П.Цюцюноў, М.В.Шчэпкін, І.А.Юркоў. **1963**. А.В.Анцімонаў, М.Ц.Архіпец, Л.М.Ашмян, В.С.Бабкоў, Ф.Ц.Бажок, А.У.Байцова, І.С.Бахір, Я.Е.Гайко, Я.П.Гоцін, А.П.Гушча, К.У.Джытера, Г.Я.Жолудзеў, В.П.Зенін, А.С.Крэмень, А.В.Круль, М.С.Кускоў, В.С.Левін, М.Ф.Майдановіч, Л.П.Мацкевіч, М.М.Машкін, У.М.Мудры, С.І.Мядзведскі, В.Ф.Наймушын, П.М. Новікаў, Я.Ф.Паўленка, А.Ш. Плоткін, Я.А.Раговін, М.З.Санкін, Г.І.Татурын, А.Б.Уласевіч, К.Дз.Цвярдоў, І.М.Чарненка. **1964**. І.А.Віленскі, М.Дз.Галубенкаў, М.В.Кавалёў, І.І.Корсакаў, В.С.Крывіцкі, Р.І.Мілановіч, А.В.Пруднікаў, У.М.Рубанік, В.Ф.Хлімянцоў, Л.С.Храмцоў. **1965**. А.Б.Бандарэнка, П.І.Бязручкін, А.К.Ворса, І.М.Вятрук, І.Ц.Гапеенка, М.Я.Глушанкоў, М.К. Дзямешка, Ф.І.Дудараў, У.М.Жур, А.І.Кавалеўскі, М.У.Конік, Ф.Я.Крот, Ц.М.Кушнераў, В.С.Ларын, Р.І.Лебедзеў, У.Я.Ліцкевіч, П.С.Лукашук, А.Дз. Майсяевіч, М.Я.Мананкоў, Б.М. Марагоўскі, В.Г.Маршалаў, М.С.Медзвядзенка, Г.К.Мітраховіч, Дз.Ф.Міхайленка, П.М.Наваржэўскі, П.Ф.Пацей, А.А. Пількевіч, С.М.Раўкоў, Я.Ф.Савіцкі, І.С.Салей, С.І.Серафімовіч, І.Х.Сіманоўскі, М.В.Скрабкоў, Л.С.Собаль, А.П.Старавойтаў, І.І.Сямак, К.М.Тандзітнікаў, М.Г.Ушкевіч, П.І.Чарнавусаў, В.П.Чарнышоў, М.І.Шалдыга, Б.А. Шаршнёў, Г.П.Шмігельскі, М.І.Шымель, І.П.Янкоўскі, М.П.Ярашэвіч. **1966**. В.Е.Алексяюк, К.А.Бародзіч, І.М.Бірыла, К.І.Вагін, Л.Я.Васілеўскі, Г.А.Вялічка, А.М.Гершаў, Г.С.Дашын, В.Р.Жылін, А.С.Зуб, С.Ф.Кажамякін, М.П.Кажан, П.І.Клімук, І.К.Лазарэнка, А.К.Лісоўскі, К.С.Мілашэўскі, А.Ф.Мітраховіч, Д.П.Надтачаеў, Р.Я.Паламарчук, Л.В.Парыйскі, Я.П.Ракомса, С.А. Сапун, П.Ф.Філіпаў, У.А.Хадорык, Ф.І.Цімафееў, С.Я.Цярохін, Л.К.Цяцерын, А.С.Чмыр, І.М.Шараеў, І.К.Юркоў. **1967**. І.С.Вараб'ёў, М.П.Варэнцаў, Я.І.Дрозд, А.А.Кавалевіч, М.М.Кавалевіч, Е.А.Каўтарэна, Ц.І.Кузьмін, А.Дз.Лакіда, М.В.Леаненка, Ф.Ф.Леановіч, С.І.Шульга. **1968**. П.Р.Аўсянікаў, М.І.Бадзько, Г.С.Бандарэнка, К.В.Вароніна, А.К.Васілеўскі, Л.Г.Гаўрылаў, Р.Я.Герцовіч, В.П.Глявіцкі, А.А.Грабеннікаў, М.А.Грыгарук, П.Р.Дадонаў, М.Г.Дзівакоў, А.Я.Каржуеў, М.К.Кесель, Ф.В.Магіленка, К.Я.Масько, М.І.Мацэль, М.М.Мядзведскі, І.Б.Палінскі, М.І.Пісарчык, С.Ф.Пятроў, В.Дз.Сабалеўскі, І.М.Сак, А.З.Сацікаў, А.І.Хамянкоў, К.С.Цывінскі, Ф.М.Шакай, Ф.І.Шчасны, Ф.І.Юшкевіч, В.Н.Ярковіч. **1969**. Дз.Д.Атрашкевіч, Ю.К.Гарашчук, Г.М.Губчык, М.М.Еліфанаў, М.І.Касценіч, С.Ц.Кірыльчук, М.І.Кудзелін, А.В.Кулікоўскі, Б.С.Курлена, І.В.Кушнераў, Ф.С.Маскоў, В.М.Няхаеў, П.Р.Паўлоўскі, А.М.Печкуроў, Дз.Дз.Прашчаеў, У.М.Рыжыкаў, С.П.Самуха, М.П.Сінцова, М.М.Унукоўскі, І.І.Ціханаў, А.А.Чыжык, С.М.Шахно, К.С.Якімовіч. **1970**. П.Н.Антоненка, М.І.Бандзюк, С.С.Бычкоўскі, І.І.Валадашчык, А.Ф.Гаўрысёў, М.І.Герасімчук, Д.Ц.Гузман, Ю.Р.Іваноў, С.М.Ізотаў, І.П.Кавалёў, С.В.Казакоў, Л.В.Казлоў, В.І.Кандраценка, М.Л.Каралюк, Р.В.Куляеў, Л.І.Кунічкіна, М.Р.Лукашэнка, Р.І.Ляшэнка, К.П.Малькевіч, С.І.Маршчэнка, М.М. Маталыцкі, М.Ф.Мацюк, А.І.Наканечны, Р.Л.Пабядзінскі, У.В.Пакацілаў, В.І.Пацюк, П.Я.Пісарчык, М.А.Пісарык, Ф.П.Пыжык, А.А.Рамаюўскі, А.А.Рамашэўскі, Д.Я.Родаў, М.Ц.Свінко, Р.С.Сілівончык, М.В.Сярмяжка, А.А.Тарасаў, А.А.Фурсевіч, Л.У.Чарапко, М.А.Шлойда, М.С.Шумакоў. **1971**. І.А.Багданаў, Р.І.Бандарэнка, М.А.Баранаў, Л.В.Голубева, А.К.Іваноў, Ф.І.Кажарскі, І.І.Казлоўскі, С.І.Казлюк, Б.М.Кіціс, Р.Дз.Купрыенка, Ф.А.Лапуноў, М.А.Літоўчанка, В.І.Луцык, М.Н.Маліноўскі, А.Н.Мінаеў, У.У.Мінкевіч, К.К.Петрушкевіч, М.І.Пунько, Г.М.Рагачова, І.В.Сабалеўскі, П.М.Сідараў, А.І.Сініцын, М.К.Смоліч, А.Л.Трубяцкой, А.А.Трухан, М.А.Федарчук, А.І.Цыганок, М.І.Яскевіч. **1972**. Ф.А.Андросік, М.Д.Бараболкін, П.Л.Бароўскі, В.І.Барысенка, Б.А.Бразінскі, Я.І.Грыняк, М.М.Грышкавец, А.С.Карамышаў, В.С.Карэўка, А.К.Клявін, В.І.Кувашоў, У.І.Курашоў, П.І.Лаўрэнка, У.А.Малашэвіч, У.Ф.Маціеўскі, Л.У.Парахонька, І.М.Пацярайчанка, У.Д.Рабянок, В.А.Руды, А.Я.Фамін, В.М.Чаркін, С.В.Шапавалаў, Р.Ф.Шукаў, Я.С.Юшкоўская, С.А.Язэпчык. **1973**. А.С.Арцюх, В.В.Дзеўнер, А.П.Забела, А.С.Закоршмены, П.П.Краско, М.В.Крутаў, Г.Н.Кудрашоў, С.С.Макавецкі, Г.П.Навасельскі, В.П.Русак, М.М.Рыгачэвіч, М.А.Сілін, П.М.Сябекін, В.А.Хворык, А.М.Чыгрэцкі. **1974**. Я.В.Барысевіч, М.У.Бегуноў, М.М.Белка, С.Л.Воўк, У.І.Гарлачоў, С.П.Жалябітка, Т.Ф.Жаркоў, Р.А.Захараў, Л.С.Зубарава, М.М.Купа, Г.І.Ліёпа, Л.Р.Міхайлоўскі, М.В.Русецкі, С.П.Саўчук, І.З.Смалякоў, І.М.Удовін, І.Т.Хачатранц, З.П.Шпарчэева. **1975**. А.П.Арцем'еў, Б.С.Бальцэвіч, М.Ф.Барадулька, І.Ц.Бялоў, К.А.Валенцік, К.А.Вяранчык, А.І.Вярстак, У.Е.Гарбацкі, Г.С. Друкараў, І.М.Еўдамашчанка, Г.П.Карлаў, І.Я.Качанаў, А.М.Крапіўка, Р.Р.Кучук, М.А.Мяжэвіч, М.П.Муранаў, П.І.Панамарэнка, У.В.Пішчыкаў, І.С. Рабочы, І.І.Раманееў, І.К.Рубахаў, В.Ц.Саяпін, І.П.Севасцьянаў, Б.А.Халадцоў, А.Ф.Шалудзько, А.С.Шчарбінін, В.А.Шыманскі, А.М.Яўціхіеў. **1976**. А.І.Акатаў, А.М.Аксёнаў, У.Ц.Алізарэвіч, П.С.Амоненка, У.А.Андросік,

К.Дз.Багданаў, С.Ц.Баярчук, Н.С.Бельчанка, П.П.Бондараў, А.А.Боршч, П.А.Брэль, Р.С.Бут-Гусаім, М.А.Гарбузаў, В.Ф.Вішнеўскі, І.А.Гапонаў, У.Ц.Гніза, Л.М.Голубева, У.С.Дзятлаў, А.Ц.Драмянкоў, В.В.Дрэнь, С.М.Жалубоўскі, А.С.Зданевіч, М.Л.Зеліхоўскі, У.І.Касоўцаў, А.Т.Касцюкоў, В.Ф.Касько, М.І.Кісялёў, Я.С.Костусеў, А.І.Краўчанка, І.А.Мейлах, Б.М.Мілер, І.М.Наваселецкі, Ф.А.Назарчук, М.М. Несцераў, І.Р.Пісарук, У.А.Рагачоў, А.У.Сарокін, І.Д.Страліцкі, А.М.Туз, Я.А.Шушкевіч, Я.К.Шэрыкаў. **1977**. М.М.Грышчэня, Р.М.Дарашэнка, А.Н. Каўрэй, А.А.Корзун, М.Ф.Лунін, М.У. Насулька, П.Л.Пастушэнка, Л.У.Табалевіч, М.К.Тышкевіч, Б.Р.Ханін, М.Р.Чумакоў, У.І.Шылаў. **1978**. В.І.Альхоўскі, П.В.Баравікоў, А.В.Богуш, В.М.Куракевіч, А.А.Луцык, Дз.Ф. Махавікоў, Р.Ф.Сялевіч, У.К.Шульга, К.С.Шулянчык, П.М.Шыпаў. **1979**. І.А.Антановіч, Э.В.Аўчыннікаў, А.І.Барташ, І.М.Бутрымовіч, А.А.Дунаеў, М.Н.Зельдас, Л.Б.Любезны, І.І.Ляўко, М.М.Мартынаў, Я.І.Маўчан, І.А.Салодкі, І.П.Чорствы. **1980**. М.А.Арэф'еў, М.К.Балыкін, У.І.Бобр, М.М.Верамейюк, М.С.Гапееў, Дз.І.Гвоздзеў, Я.М. Гопша, А.Ц.Доўгі, І.І.Дубовік, І.А.Кенік, А.Т.Кічкайла, А.Т.Кобля, В.А.Крамар, М.М.Лавянецкі, І.Р.Ладуцька, К.А.Лапец, М.М.Лапко, Ф.Р.Літвіновіч, Г.А.Мадалінскі, В.І.Макараў, Я.А.Мартыненкаў, Р.М.Махліс, В.В.Пыжык, К.П.Пятрыніч, Ф.Ф.Раманчук, Ю.А.Сабалеўскі, М.Ц.Салдаткін, А.К.Самароссенка, М.П.Сачок, М.П.Свірыдовіч, П.В.Селівонік, Я.Г.Селівончык, А.А.Сідарук, А.Г.Танаян, Ф.Я.Таўкачоў, В.І. Трубянок, І.У.Філоненка, У.І.Харужы, А.М.Целеш, З.М.Шалыга, І.Р.Шкрабнёў. **1981**. М.П.Аляксюк, У.І.Газдзецкі, Л.Ц.Кацько, А.І.Малыха, М.М.Малярэвіч, М.Я.Талсташэеў, М.С.Трусевіч, Г.В. Юшкевіч, М.Я.Юшкевіч, М.Я. Ярошкін. **1982**. Р.М.Баглай, У.М. Гаўрылаў, І.І.Дзянішчык, В.І.Жалудко, Л.І.Максімовіч, З.Я.Паланецкі, М.Ф. Сайкоўскі, Г.Т.Сіўцоў, І.А.Тарасавец, А.В.Тарасевіч, А.Р.Цыбуля, В.М.Шантаровіч, П.У.Якубчык. **1983**. Я.П.Стойка. **1984**. М.Д.Белы, А.З.Бялевіч, В.М.Веліканаў, А.П.Дзямчук, Д.Д.Дук, А.С.Емяльянаў, М.М.Кандакоў, М.Я. Краснарадцаў, І.І.Лазараў, Ю.А.Пуплікаў, А.І.Смольскі, М.І.Тарун. **1985**. Я.Р.Брычкоўскі, В.І.Бялоў, А.Г.Ваўранюк, В.М.Ветраў, Я.Ф.Вінакураў, Дз.П.Дземчанка, В.С.Зданевіч, І.П.Капітула, А.А.Каспяровіч, М.І.Папоў, П.П.Пракаповіч, Ф.М.Русак, М.С.Такоеў, Я.А.Траян, А.Дз.Фядотаў, А.В.Цадзілка, П.М.Ціханкоў. **1986**. У.В.Аляшкевіч, Я.С.Бельская, Г.К.Варакса, В.І.Кажураў. **1987**. І.З.Башмакоў, В.С. Барысевіч, А.У.Князеў, А.П.Кучэйка, У.М.Лагута, К.Л.Пятроўскі, А.І.Сазонаў, П.К.Чыгірык. **1988**. У.І.Казлоўскі, І.А.Нялюбін, М.С.Шамес. **1989**. М.М.Дабрыцкі, М.Е.Капытоў, Ю.Б.Колакалаў, Л.І.Рыжкоў, У.С.Тамашук, А.Т.Шота, І.П.Шпорта, Ю.А.Шэпелеў. **1990**. Ю.С.Астравух, Г.А.Баранаў, В.П.Баліцкі, Ф.Я.Бойка, М.К.Звонкін, Б.І.Касцюкевіч, В.А.Кулакоўскі, А.А. Ламакаў, В.І.Міцкевіч, І.І.Свярдлоў, В.А.Смірноў, Г.І.Станчык, В.В.Цімохін, П.М.Ціхановіч, А.Ф.Чуясаў, Л.С.Штырыкаў. **1991**. М.З.Ашэйчык, В.Ф.Залога, В.В.Каржэўскі, Л.І.Мароз, Л.Ф.Марозаў, А.І.Міхалевіч, У.П.Набокаў, В.П.Пятрыніч, А.Ф.Усціновіч, М.Дз. Цюшко. **1993**. П.Дз.Андрэйкавец, А.П. Гапееў, Л.М.Красуцкі, С.А.Мазур, А.Я. Піскоўскі, К.М.Пячко, Л.Л.Чайлытка, А.Я.Янчэўскі. **1994**. А.Дз.Зарубін, Р.Б. Кацынель, С.К.Лемеш, Т.І.Паляшчук, Л.І.Тарашкевіч, Ю.І.Уладзіміраў, У.І. Францкевіч, А.В.Якубёнак. **1995**. Я.М.Галубкоў, Л.Б.Ваўчэцкі, А.У.Луцко, А.М.Макараў, У.Ц.Рагель, В.П.Сянцюраў. **1996**. І.Я.Галіноўскі, С.У.Кунцэвіч, С.У.Міхалёнак. **1997**. І.Р.Гапееў, В.А.Кулеба, Р.А.Шпакоўскі, А.М.Якаўлеў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ВЫНАХО́ДНІК РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца вынаходнікам — аўтарам укаранёных у вытворчасць вынаходстваў, што ўносяць істотны ўклад у тэхн. прагрэс і маюць важнае дзяржаўнае значэнне, а таксама за шматгадовую вынаходніцкую дзейнасць. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 9.10.1959 існавала ганаровае званне заслужаны вынаходнік БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя вынаходнікі Рэспублікі Беларусь

1960. Д.Л.Калеснікаў, Ю.І.Карнацкі, Р.С.Неруш, Ю.М.Татараў. **1963**. М.І. Несцярэнка. **1964**. І.П.Агафонаў. **1966**. Р.І.Халадзінскі. **1967**. Дз.А.Антонаў, У.А.Белы, К.В.Кляменцьеў, А.Я.Розенберг. **1968**. Ф.Ц.Лугаўнёў. **1970**. В.У. Войцікаў, В.І.Жагіра, У.С.Каханович, І.Д.Мяніцкі, Л.М.Рэмаў. **1972**. Н.М.Гімельфарб. **1975**. В.М.Балакла, С.І.Даўгалёў, Б.М.Залуцкі, М.А.Якіменка. **1976**. В.А.Сляпцоў. **1977**. М.П.Шатэрнік. **1979**. У.С.Балбасаў, І.Г.Зяньковіч, У.А.Лабуноў, В.М.Кандрацьеў. **1980**. І.М.Плехаў, А.С.Шашнян. **1981**. В.П.Далгоў, Э.К.Дзятко, Б.І.Купчынаў, У.А.Сітаў. **1984**. Г.І.Аляксееў. **1986**. Л.Р.Дубінскі, В.С.Парфіяновіч. **1988**. М.І.Багдановіч, М.М.Слюсар, П.А.Цакун. **1989**. В.К.Дубікоўскі, С.С.Герцовіч, Я.М.Ішуцінаў, Г.Л.Калганаў, У.А. Канстанцінаў, А.Дз.Коўтун, А.Б.Краснікаў, Л.Д.Тарасенка, І.І.Шонараў, І.З.Шпак. **1990**. У.П.Байкоў, У.С.Кастамараў, С.Н.Леках, М.А.Мялыгуй, А.М.Салагуб, Г.І.Сідарэнка, Л.Л.Счыслёнак, В.Я.Шчукін. **1991**. А.Г.Асан-Джалалаў, У.К.Дабрынец, І.М.Шульга. **1992**. Я.І.Маруковіч, А.Дз.Маслакоў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ГЕО́ЛАГ-РАЗВЕ́ДЧЫК БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, прысвойвалася высокакваліфікаваным рабочым, інжынерна-тэхн. работнікам геал., геафіз., гідрагеал., тапографа-геад. службаў і н.-д. устаноў, якія працавалі па спецыяльнасці не менш за 10 гадоў і мелі вял. заслугі ў галіне геолага-разведачных работ, падрыхтоўкі і выхавання кадраў геолагаў і разведчыкаў нетраў. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 22.7.1968, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 1995.

Заслужаныя геолагі-разведчыкі БССР

1968. А.А.Аўксенцьеў, В.А.Зайцаў, І.І.Зелянцоў, А.К.Калашынскі, П.А.Леановіч, У.І.Мельнікаў, П.А.Скалаба, В.Г.Тарбееў. **1969**. М.М.Грыпінскі, В.В. Дзіхціеўскі, Б.Ю.Жукоўскі, У.А.Каржэўскі, В.Р.Лебедзеў, Ю.І.Паўлаў, А.П. Сянько, П.І.Хаўратовіч. **1971**. М.Ц.Жулега, А.А.Клапкоў, В.А.Караблёў, М.А. Таргонскі, І.І.Цімашэнка. **1977**. А.П.Лаўроў. **1984**. А.П.Сарокін.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ДЗЕ́ЯЧ КУЛЬТУ́РЫ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокакваліфікаваным работнікам культ.-асв. устаноў, кінафікацыі, радыёвяшчання і тэлебачання, друку, выд-ваў, паліграф. прам-сці і інш., што працуюць у галіне культуры не менш за 15 гадоў, маюць вял. заслугі ў яе развіцці. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 2.7.1957 існавала званне засл. дз. культ. Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. У 1971—95 прысвойвалася званне *заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь*.

Заслужаныя дзеячы культуры Рэспублікі Беларусь

1957. П.М.Касач, Б.І.Любовіч, І.Б.Сіманоўскі, П.І.Шыдлоўскі. **1959**. С.П. Астравумай, У.А.Жлукценка, У.Ф.Луцэвіч, М.М.Тышэвіч, М.І.Шчансновіч. **1960**. С.М.Грабеншчыкоў, А.А.Дзярута, А.П.Лукомскі, Ф.Ф.Пятрэнка, П.А.Радоліцкі, В.М.Сакалоў, А.А.Слесарэнка, В.М.Смірноў, А.К. Шыдлоўскі. **1961**. І.Б.Сакольскі. **1962**. В.А.Захараў, М.І. Фрыдман. **1963**. М.Т.Бяспалаў, Л.П. Валчэцкі, А.М.Валынчык, Н.Б.Ватацы, К.Дз.Гусеў, Р.Я.Кісялёў, М.Р.Солапаў, А.Я.Фінкельберг, А.С.Чопчыц, М.М. Чысцякоў, Л.І.Ячнеў. **1964**. У.Я.Карпаў, А.Ф.Кутай, Л.Дз.Ляшэнка, Ф.М.Міхайлаў, А.С.Плеўскі, Р.П.Раскевіч, А.Г.Русак. **1965**. Дз.Р.Новікаў, М.М.Салдатаў, М.М.Сімкоўскі. **1966**. М.Я.Дадзькоў, Ю.А.Залатарэнка, У.І.Кулікоўскі, П.В. Мядзёлка, В.Н.Пазняк, С.П. Школьнікаў. **1967**. А.М.Бачыла (Алесь Бачыла), А.У.Броўка, В.М.Варатнікоў, Б.З.Галубоўскі, М.А.Ільічоў, А.І.Каландзёнак, К.Ф.Калітоўская, Я.І.Качан, Ф.Я.Кляцкоў, Г.Я.Кутневіч, Л.К.Кухарава, І.В. Ляшчынскі, К.Л.Манучараў, Я.Г.Міско, І.Ф.Міхалюта, І.Р.Новікаў, В.П.Палескі-Станкевіч, В.Х.Партной, Д.Ш.Пінхасік, М.І.Пржыбытка, В.А.Пыжкоў, В.Е.Самуцін, К.В.Суворай. **1968**. У.І.Аніковіч, Г.Б.Асвяцінскі, Л.Я.Бацвіннік, І.А.Бейдзін, Г.В.Будай, М.М.

Бяльзацкая, І.Я.Васілеўскі, Б.Я. Вішкароў, К.Г.Высоцкі, В.Ц.Гарбатоўскі, В.А.Данілевіч, Дз.М.Жураўлёў, М.В.Ісакоўскі, Э.А.Казачкоў, К.А.Калечыц (Буйло), М.Г.Кіракозаў, Л.У.Кісялёва, Я.А.Комік, Г.С.Лысоў, Я.С.Мазалькоў, М.Ц.Марушкевіч, Ф.М.Нікіфараў, П.С. Пестрак, А.А.Пракоф'еў, В.Ф.Праскураў, С.Э.Сапешка, Н.М.Саўчанка, І.А. Серыкаў, В.П.Смоляр, У.В.Таран, Г.Г.Удараў, І.М.Фёдараў (Янка Маўр), М.Я.Філімонаў, Я.А.Хелемскі, В.Р.Шапавалава, І.Р.Юшанкоў, А.В.Яблонскі, А.І.Якімовіч. **1969**. А.С.Вялюгін, І.Д. Гурскі. **1970**. К.Ц.Кірэенка, У.І.Корбан, Ц.В.Крысько (Васіль Вітка), Д.К.Міцкевіч. **1971**. М.І.Акшэўскі, І.С.Аляксанаў, Т.М.Аляксеева, Т.П.Бастун, В.Ф. Вольскі-Зэйдэль, Ф.М.Ганчар, М.В. Гарбачоў, А.Р.Ільюшэнка, І.К.Казлоў, А.Т.Каўко, Н.А.Конанава, А.У.Лісоўскі, А.Ф.Мазурава, В.І.Розін, І.П.Тартоўскі, М.Дз.Троіцкая, В.А.Чарняўская, М.І. Шыбаліс, Л.Б.Эйдзін, М.С.Юрэвіч, Т.М.Якута. **1995**. У.А.Цацоха. **1996**. А.Р.Майсененка, Э.М.Скобелеў, Л.П. Ударава. **1997**. Г.М.Алейнік, У.П.Вялічка, У.П.Мальчыкаў, Л.І.Пятрова, В.Г. Рагоўская, І.Д.Сіпакоў, Б.В.Стральцоў, І.У.Угальнік, Е.П.Фешчанка. **1998**. М.К.Грэсь, Э.В.Кірыленка, Я.М.Лабовіч, Р.В.Сакалоўскі, У.М.Сяргейчык, Н.І.Урукіна.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ДЗЕ́ЯЧ МАСТА́ЦТВАЎ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. рэжысёрам, балетмайстрам, дырыжорам, хормайстрам, кампазітарам, драматургам, мастакам, архітэктарам, дызайнерам, мастацтвазнаўцам і інш. дзеячам мастацтваў, якія працуюць у галіне мастацтва 15 і больш гадоў і зрабілі значны ўклад у развіццё культуры і мастацтва, або за вял. заслугі ў выхаванні і падрыхтоўцы творчых кадраў, стварэнні навук. прац. Званне засл. дз. мастацтваў Беларускай ССР устаноўлена 5.12.1927 і прысвойвалася СНК БССР, з 1938 — Прэзідыумам Вярх. Савета БССР; з 1991 званне засл. дз. мастацтваў Рэспублікі Беларусь прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з законам ад 13.4.1995 прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Заслужаныя дзеячы мастацтваў Рэспублікі Беларусь

1934. І.Р.Лангбард, М.Г.Манізер. **1935**. Б.Л.Брадзянскі, А.Вольны (А.І.Ажгірэй), Р.Я.Кобец, У.У.Корш-Саблін. **1938**. З.І.Азгур, А.А.Бембель, А.В.Грубэ, М.А.Керзін, У.У.Кумельскі, Г.К.Папавіцкі. **1939**. Я.М.Кругер. **1940**. А.М.Бразер, А.П.Воінаў, В.В.Волкаў, Н.Б.Грубін, В.А.Залатароў, Я.У.Зільберберг-Скупнік, Н.І.Паніна, А.Я.Туранкоў, Я.К.Цікоцкі, П.І.Ціханаў, М.М.Чуркін, М.Э.Шнейдэрман. **1944**. І.В.Ахрэмчык, А.В.Багатыроў, А.К.Глебаў, І.У.Жалтоўскі, Я.А.Зайцаў, У.М.Кудрэвіч, Ф.А. Мадораў, А.П.Марыкс, М.Ф.Садковіч. **1945**. Н.Б.Лойтар, С.П.Нікалаеў. **1946**. Л.М.Літвінаў (Гурэвіч), Р.Р.Шырма. **1949**. Т.К.Лапаціна, М.А.Міцкевіч, Г.М. Пятроў, А.А.Рыбальчанка, І.М. Ушакоў, Г.І.Цітовіч, Л.А.Ярмоліна. **1952**. А.Б.Скібнеўскі. **1953**. В.Ф.Фёдараў. **1954**. Т.М.Каламійцава, Я.В.Кладухін, Л.У.Любімаў, П.В.Масленікаў. **1955**. У.Л.Акуліч, Я.Э.Віцінг, А.І.Гінцбург, І.А.Гіттарц, А.Б.Грыгар'янц, А.Р.Зархі, Дз.А.Лукас, М.Ф.Маслаў, А.В.Міронскі, Я.Дз.Нікалаеў, Р.К. Пукст, С.І.Селіханаў, У.П.Сухаверхаў, В.К.Цвірка, В.А.Яфімаў. **1956**. Б.Ф.Звінагродскі, Б.Х.Кабішчар, І.І.Любан, Л.І.Мазалеўская, К.А.Мулер. **1957**. У.У.Алоўнікаў, К.К.Казелка, П.П.Падкавыраў, М.М.Пігулеўскі. **1959**. Г.Б.Шчарбакоў. **1960**. П.С.Акулёнак, Л.У.Голуб. **1961**. А.Р.Апанасенка, Ю.А.Арыянскі, П.А.Данілаў, І.Л.Дорскі, В.Ф.Сербін, У.М.Стэльмах. **1963**. Л.М.Абеліёвіч, А.Л.Андрэеў, Г.М.Вагнер, А.П.Кагадзееў, Дз.Р.Камінскі, К.М.Касмачоў, А.А.Паслядовіч, Ю.У.Семяняка, А.Дз. Шыбнёў. **1964**. І.С.Абраміс, А.А.Булінскі, Я.Б.Парватаў, У.Дз.Станкевіч, М.М.Фігуроўскі, У.П.Цяслюк. **1965**. К.П.Стэцкі. **1966**. А.В.Аладава, Н.М. Воранаў, Я.А.Глебаў, К.Л.Губарэвіч, С.Р.Раманаў. **1967**. М.З.Бераў, І.Н.Вейняровіч, А.Дз.Забалоцкі, В.Р.Карпілаў, І.І.Кузняцоў, Л.М.Лейтман, К.І.Паплаўскі, С.К.Скварцоў. **1968**. Е.М.Ганкін, М.Ц.Гуцеў, Р.У.Кудрэвіч, В.У.Роўда. **1969**. М.Лужанін (А.А.Каратай), Р.І.Масальскі. **1970**. В.А.Грамыка, А.М.Дадышкіліяні, П.С. Крохалеў, П.К.Любамудраў, М.М.Марусалаў, М.А. Савіцкі, С.І.Сплашноў. **1973**. У.П.Белавусаў, М.В.Данцыг, С.С.Казіміроўскі, А.М.Кашкурэвіч, І.М.Лучанок. **1974**. Э.П.Герасімовіч, І.М.Дабралюбаў, Ю.А. Марухін, Л.С. Мухарынская, Б.М.Сцепанаў, М.П. Фрайман, В.П.Чацверыкоў, Ю.М.Яфімаў. **1975**. М.Д.Браценнікаў, Б.І.Луцэнка, У.І.Няфёд, І.Ц.Пікман, Дз.Б. Смольскі, В.Ц.Тураў. **1976**. А.С.Гутель, В.М.Елізар'еў, В.М.Раеўскі. **1977**. Г.Х.Вашчанка, Б.Ф.Герлаван, Л.М.Гумілеўскі, А.М.Заспіцкі, У.А.Маланкін, А.А.Малішэўскі, Л.М.Мягкова, Г.Г.Паплаўскі, Ю.М.Тур, Л.Дз.Шчамялёў. **1978**. С.М.Вакар, В.Н.Дашук, М.П.Дрынеўскі, Я.А.Ігнацьеў, М.А.Казінец, В.П.Шаранговіч. **1979**. У.А.Дзямянцьеў, Э.Дз.Корсакаў, І.Г.Смірноў, Б.С.Смольскі, Б.А.Шангін. **1980**. А.І.Бутакоў, В.М.Гольдфельд, А.З.Гутковіч, С.А.Картэс, А.М.Кішчанка, У.А.Машэнскі, І.Н.Стасевіч. **1981**. Дз.І.Алейнік, Б.А.Аліфер, Л.П.Асецкі, Дз.Я.Зайцаў, В.Г.Кубараў, Ю.В.Лысятаў, В.А.Нікіфараў, В.С.Пратасеня, С.У.Пятроўскі, У.І.Стальмашонак, В.Ф. Сумараў. **1982**. А.Ю.Мдывані, М.М. Пташук, А.А.Салаўёў, Э.С.Ханок. **1983**. В.А.Леантовіч, І.Ц.Ціханаў, Р.Ю.Шаршэўскі. **1984**. В.Я.Мазынскі. **1985**. Л.К.Захлеўны, А.Я.Карпаў, Р.Ф.Сурус. **1986**. В.У.Дудкевіч, М.В.Сірата. **1987**. М.К.Казакевіч, Л.П.Лях, З.Я.Мажэйка. **1988**. У.В.Дарохін, В.К.Іваноў, І.П.Рэй, Г.Р.Фаміна. **1989**. В.В.Варановіч, С.А. Волкаў, П.С.Дурчын, І.Я.Міско, Н.І.Шчасная. **1990**. Ю.П.Альбіцкі, У.К.Гоманаў, У.П.Забела, А.Р.Захараў, Л.Л.Іваноў, М.М.Ізворска-Елізар'ева, Б.А.Крапак, У.С.Мурахвер, М.М.Пушкар, Ф.Дз.Пыталеў, Я.М.Рэутовіч, У.П. Савіч, У.А.Тоўсцік, М.Я.Фінберг. **1991**. В.Д.Анісенка, А.С.Бархаткоў, Я.С.Бусел, А.А.Дударэнка, Л.А.Дударэнка, Б.І. Казакоў, М.С.Кірылаў, З.В.Літвінава, В.П.Рыбараў, І.А.Цвятаева, Ю.М.Цвяткоў, Ю.М.Чурко, У.А.Шаліхін, В.М. Шаталаў, Л.Б.Яфімава. **1992**. А.В.Бараноўскі, Т.А.Дубкова, Ю.А.Карачун, М.У.Кірэеў, М.Р.Солапаў, У.В.Уродніч, А.І.Чартовіч. **1993**. І.М.Сталяроў. **1994**. Дз.М.Браўдэ, Э.Б.Зарыцкі, М.С.Калядка, П.М.Макаль, І.Г.Мацюхоў, Н.І.Мацяш, У.Я.Пузыня, М.А.Рыжанкоў. **1995**. Л.К.Алексютовіч, В.А.Войцік, П.А.Данелія, Г.П.Зелянкова, І.М.Паньшына, В.Л. Рахленка. **1996**. Б.У.Аракчэеў, І.С.Дмухайла, А.І.Калядэнка, Т.М.Паражняк, Г.Ф.Шутай, Н.Л.Янушкевіч. **1997**. І.К.Абразевіч, У.А.Караткевіч, Г.С.Пячонкіна, М.У.Сацура, У.П.Скараходаў. **1998**. А.А.Козак, А.М.Лапуноў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ДЗЕ́ЯЧ НАВУ́КІ І ТЭ́ХНІКІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася за асабліва каштоўныя працы ў галіне навукі і тэхнікі, за асабліва важныя для сацыяліст. буд-ва адкрыцці і вынаходствы ці за выдатную навукова-практычную і навукова-папулярызатарскую дзейнасць. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 7.8.1940, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 23.11.1988.

Заслужаныя дзеячы навукі і тэхнікі Беларускай ССР

1949. Э.Х.Адэльскі, А.А.Краўцоў. **1954**. Ф.П.Вінакураў, С.І.Губкін, М.В.Дарашэвіч, І.М.Ліўшыц, М.Я.Мацапура, В.В.Папоў, А.І.Руцкі, І.І.Рыжкоў. **1958**. Я.І.Дрозд. **1962**. Б.Л.Шапашнік. **1963**. В.П.Севярдэнка, А.Б.Трэйвас, І.Г.Ціхаміраў. **1965**. І.Л.Любошыц. **1968**. Г.В.Багамолаў, К.В.Гораў, А.К.Красін, І.І.Купчынаў, М.М.Сірата, Д.А.Чудакоў. **1971**. У.Г.Вафіядзі. **1972**. Я.Р.Канавалаў, І.С.Цітовіч, П.І.Яшчарыцын. **1975**. А.С.Вечар, А.М.Шырокаў, Г.М.Якаўлеў. **1976**. М.С.Высоцкі, А.У.Роман, В.Я.Савельеў, А.П.Федзін. **1977**. В.М.Арцем'еў, С.Х.Будыка, Р.Я.Паспелаў, М.У.Праўдзін. **1978**. Г.А.Анісовіч, У.А. Белы, П.С.Грунтоў, С.С.Забродскі, В.В.Кацыгін, Л.І.Кісялеўскі, І.І.Ліштван, В.А.Мішчанка, В.Б.Несцярэнка, А.Г.Шашкоў. **1979**. Б.М.Багдановіч, В.У.Гуськоў, А.Ф.Чарняўскі. **1980**. С.С.Атаеў, Н.М.Бабкова, Я.І.Бельскі, П.І.Бялькевіч, В.С.Буракоў, У.В.Пячкоўскі, У.П.Сцепанчук. **1981**. А.Я.Ахрыменка, М.М.Бадзяка, І.І.Леановіч, С.І. Назараў, А.А.Юрцаў. **1982**. У.П.Гольцаў, А.І.Грышкевіч, А.П.Дастанка, С.С.Шушкевіч. **1985**. В.У.Мураўёў, А.В.Сцепаненка, П.М.Чаголін.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ДЗЕ́ЯЧ НАВУ́КІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца выдатным вучоным, якія маюць вучоную ступень д-р н., за заслугі ў распрацоўцы прыярытэтных кірункаў навукі і тэхнікі, стварэнні навук. школ, выхаванні і падрыхтоўцы навук. кадраў. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1940 існавала званне засл. дз. нав. БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя дзеячы навукі Рэспублікі Беларусь

1938. М.Л.Выдрын, У.В.Марзон, С.М. Мялкіх, М.М.Нікольскі, У.В.Шкатэлаў. **1939**. Ю.М.Іргер, Я.В.Корчыц, В.А.Лявонаў, Л.Я.Сітэрман, І.Т.Цітоў. **1940**. Ю.А.Вейс, А.К.Кедраў-Зіхман, Х.Л. Маршак, М.Н.Шапіра. **1944**. Ц.М.Годнеў, А.Р.Жэбрак, В.М.Лубяка, М.Е.Макушок, К.М.Міцкевіч (Я.Колас), Л.М. Ніканаў, У.М.Перцаў, А.Я.Пракапчук. **1946**. Б.І.Трусевіч. **1948**. У.В.Бабук, Ф.А.Яхімовіч. **1949**. Х.С.Гарагляд, І.Я. Дземідзенка, К.М.Караткоў, П.П.Рагавой, М.Ф.Ярмоленка. **1951**. М.І.Жыркевіч, І.С.Лупіновіч. **1956**. І.Ф.Гаркуша, В.К.Захараў, В.І.Пераход. **1958**. Л.С.Персіянінаў, М.К.Юскавец. **1961**. С.І.Цішкоў. **1964**. Т.В.Бірыч, Д.А.Маркаў, П.М.Маслаў, І.Дз.Мішэнін. **1965**. Р.Т.Вільдфлуш, М.А.Дарожкін, С.С.Захараў, І.М.Курбатаў, А.І.Новік, М.С.Савіцкі. **1966**. М.У.Вінаградаў, Г.Х.Даўтяла, В.А.Маркс, Г.А.Мядзведзева, І.М.Старавойтаў. **1967**. А.Дз.Адэнскі (Пінчук), І.А.Булыгін, В.Ф.Купрэвіч, У.П.Лемеш, К.І.Лукашоў, М.Дз.Мухін, М.Дз.Несцяровіч, А.Н.Сеўчанка, Б.М. Сосіна-Ізраіцель, Б.І.Сцяпанаў, Э.П. Сюбарава, М.П.Яругін. **1968**. І.Б.Аляшкевіч, Ю.В.Гулькевіч, У.І.Крылоў, А.І.Міхельсон, А.Р.Мядзведзеў, В.І. Пансевіч-Каляда, П.Я.Пракопаў, В.Ф. Пятроў, С.Г.Скарапанаў, І.М.Сяржанін, Ф.І.Фёдараў, С.А.Чуніхін, В.І. Шэмпель, І.Д.Юркевіч. **1971**. П.В.Астапеня, А.Ю.Бранавіцкі, М.Г.Булахаў, Л.В.Валадзько, Д.М.Голуб, М.А.Жыдовіч, В.А.Іванова, І.М.Лушчыцкі, У.М. Сікорскі. **1972**. І.П.Антонаў, В.Я.Віхроў, М.М.Ганчарык, Г.І.Гарэцкі, М.У.Дзямбінскі, І.М.Качура, І.Р.Некрашэвіч, М.М.Паўлючэнка, М.У.Смольскі, Г.К. Татур, М.В.Турбін, М.Я.Шкляр, Ф.М.Янкоўскі, М.М.Янчур. **1973**. П.І.Альсмік, М.І.Афонін, В.М.Зубец, П.Ф.Ракіцкі, К.М.Сонцаў. **1974**. В.В. Барысенка, У.М.Велічэнка, М.С.Жакаў, А.І.Івіцкі, Т.Н.Кулакоўская, Ф.П.Майсеенка, Р.С.Мастыка, А.Ф.Печкуроў. **1975**. П.У.Броўка, С.Н.Іваноў, М.М.Ламака, П.Дз.Пузікаў, Дз.А.Супруненка, А.Л.Сямёнаў, Л.С.Чаркасава, К.І.Шабуня. **1976**. У.В.Анічэнка, Л.І.Багдановіч, А.А.Ключароў, В.В.Свірыдаў. **1977**. М.М.Грынчык, І.С.Краўчанка, М.Р. Ларчанка, Дз.В.Палешка, С.А.Самцэвіч, В.І.Сцяпанаў, А.У.Шот. **1978**. Ю.М.Астроўскі, К.К.Атраховіч (Кандрат Крапіва), М.В.Бірыла, Б.Б.Бойка, Б.В.Бокуць, К.П.Буслаў, А.М.Ганчарэнка, Р.Г. Гарэцкі, З.А.Дзмітрыева, А.С.Дзмітрыеў, М.А.Ельяшэвіч, І.С.Жарыкаў, А.І.Жураўскі, У.С.Камароў, Ю.Ф.Мацкевіч, М.І.Міцкевіч, І.Я.Навуменка, У.А.Піліповіч, Ю.С.Пшыркоў, У.А.Радкевіч, І.Н.Рахцеенка, Я.А.Сідаровіч, Л.М.Сушчэня, Л.У.Хатылёва. **1979**. Б.В.Ерафееў, Э.І.Злотнік, Г.М.Ліўшыц, Дз.А.Маслакоў, Р.П.Мацвяйкоў, Я.Б. Меве, Г.І.Новікаў, С.І.Пляшчанка, В.С. Шавялуха. **1980**. Н.С.Гілевіч, А.С.Крук, Г.М.Лыч, А.С.Махнач, А.С.Мішараў, У.С.Раманаў, А.М.Рубінаў, А.М.Саржэўскі, Р.І.Старобінец, М.Р.Суднік, В.Дз.Ткачоў, І.Ф.Харламаў, Л.М.Шнеерсон, В.П.Якушка. **1981**. Т.П.Ільінская, В.А.Каваленка, Г.Ц.Кавалеўскі, М.Ф.Казлоў, Н.В.Каменская, А.В.Мірошенка, Т.А.Раманава, І.Н.Усаў. **1982**. Е.Л.Бондарава, Р.Габасаў, В.А.Мохарт, У.П.Платонаў, А.У.Руцкі, М.Р.Сачак, А.С.Чернавой, І.Р.Цішчанка, П.П.Шуба. **1983**. А.А.Ахрэм, А.Г.Заўялкаў, М.В.Караблёў, В.М.Чачын. **1984**. А.А.Кірпічэнка. **1985**. Г.І.Сідарэнка, В.А.Скотнікаў. **1987**. І.Р.Варановіч, А.І.Мурашка. **1988**. З.П.Шульман. **1989**. І.М.Ахвердаў, У.І.Новаш, Р.Л.Турэцкі. **1990**. Г.І.Герасімовіч, М.В.Залашка, У.Г.Колб, Г.У.Кручынскі, Л.К.Лукша, В.У.Мартынаў, М.А.Слямнёў, А.Я.Супрун, Р.І.Тарануха, А.С.Фядосік. **1991**. П.А.Віцязь, У.В.Гарбачоў, І.М.Грышын, А.П.Іваноў, Г.Дз.Карпенка, А.А.Крыўчык. **1992**. М.І.Вараб'ёў, М.І.Жукаў, А.І.Кубарка, Ц.М.Пецольд, Дз.М.Худакормаў, А.І.Яршоў. **1994**. М.А.Барысевіч, П.І.Лабко, В.І.Шабайлаў. **1995**. П.А.Апанасевіч, Ю.Л.Максімаў, Л.Я. Супрун, В.С.Танаеў, М.Дз.Цяўлоўскі, А.С.Шайнян, Л.А.Шамяткоў, Г.Г. Шанько. **1996**. Я.М.Бабосаў, У.Р.Барышэўскі, М.І.Дзямчук, А.І.Зелянкоў, А.І.Камяк, В.І.Семянкоў, У.С.Улашчык, С.У.Федаровіч, А.П.Хількевіч, М.І.Юрчук. **1997**. Ф.В.Аляшкевіч, І.І.Антановіч.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ІНЖЫНЕ́Р СЕ́ЛЬСКАЙ ГАСПАДА́РКІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным інжынерам калгасаў, саўгасаў, міжгаспадарчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў і арг-цый Сельгастэхнікі і воднай гаспадаркі, н.-д. устаноў і праектных ін-таў, канструктарскіх бюро, доследных станцый, эксперыментальных баз, навучальных гаспадарак, с.-г. органаў, што бездакорна працавалі па спецыяльнасці ў сельскай гаспадарцы не менш як 10 гадоў, мелі вялікія заслугі ў механізацыі с.-г. вытв-сці, укараненні перадавых метадаў працы, навук.-тэхн. дасягненняў, павышэнні эфектыўнасці выкарыстання с.-г. тэхнікі і актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 1.2.1978, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 1988.

Заслужаныя інжынеры сельскай гаспадаркі БССР

1978. Р.І.Байдак, В.С.Нікіценка, Б.М. Пажарскі, Я.А.Сантаровіч. **1979**. М.А. Аляксейчык, В.С.Валадось, С.В. Юркевіч. **1980**. Б.П.Лявонцьеў. **1982**. У.В. Ліпніцкі. **1984**. У.Г.Бабіцкі. **1988**. А.П.Куляшоў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ КАНСТРУ́КТАР БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася работнікам канструктарскіх і тэхнал. арг-цый, н.-д. устаноў, вытв. і навук.-вытв. аб'яднанняў і прадпрыемстваў за вял. ўклад у распрацоўку і ўкараненне прынцыпова новай высокаэфектыўнай тэхнікі, што па сваіх тэхн.-эканам. паказчыках адпавядае айч. і сусв. узроўням. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 19.8.1985, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Скасавана 23.11.1988.

Заслужаныя канструктары Беларускай ССР

1986. В.Т.Куляшоў, М.М.Хромчанка.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ЛЕСАВО́Д РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. спецыялістам лясгасаў, лесаўпарадкавальных і інш. устаноў, прадпрыемстваў, арг-цый лясной гаспадаркі, работнікам прыродаахоўных органаў і арг-цый, якія працуюць па спецыяльнасці 15 і больш гадоў, за заслугі ў развіцці лясной гаспадаркі, зберажэнні і павелічэнні лясных багацця́ў, захаванні расліннага і жывёльнага свету, вырашэнні складаных экалагічных праблем. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1963 існавала ганаровае званне засл. лесавод БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя лесаводы Рэспублікі Беларусь

1964. Я.І.Крыўчэня. **1965**. І.П.Грыцэнка, Б.Дз.Жылкін, Ф.Ф.Кавалеўскі, Ц.М.Качаткоў, А.І.Літвінаў, Ф.С.Сушкевіч, Ф.Б.Трыбушэўскі, І.М.Хмялеўскі. **1966**. Р.М.Капытаў, П.К.Мацвеенка, М.М.Палевікоў, Я.А.Сарокін. **1968**. Р.Я.Арцёменкаў, Т.К.Бадунова, У.Г.Вядзьгун, М.К.Івашкавец, П.Д.Клімянкоў, С.П.Крывянкоў, К.Ф.Мірон, І.І.Пудаў, П.П.Хлебаказаў. **1969**. Я.Г.Арленка. **1970**. А.Д.Ганчароў, А.І.Даўтяла, С.Ц. Майсеенка. **1975**. А.М.Статкевіч. **1977**. А.У.Агароднікава, С.І.Баброў, Р.Е.Бондар, В.М.Галалобаў, Л.А.Дружына, Дз.А.Кірэеў, М.А.Лабкоў, А.І.Саўчанка, М.І.Смірноў, В.В.Хатулькоў. **1978**. С.С.Балюк, В.А.Вакула, В.А.Ткачоў. **1979**. З.М.Зяленка, Т.А.Калантай, А.Я.Мірошенка, І.П.Мухураў, У.П. Швец. **1980**. М.Т.Афанасенка, Р.П.Бондараў, М.А.Калееў, В.К.Паджараў, Ю.Дз.Сіроткін. **1981**. А.С.Барадзін, І.С. Бурак, П.Н.Грамыка, Л.В.Дольскі, М.П. Кажамякін, М.В.Міхалковіч, І.І.Прыхно, С.А.Рублеўскі. **1982**. В.С.Зязюлін, Б.В.Ржэўскі, Дз.В.Семянюк. **1983**. П.А. Салавей. **1985**. В.І.Казіцкі, Я.У.Лукша.

1987. В.М.Быкаў, П.П.Каралевіч, У.М. Курганаў. **1989**. І.А.Алейнікаў, А.І.Буй, С.І.Вайцялёнак, І.Н.Зубрэй, А.М.Панамароў. **1990**. М.Д.Бабаедаў, М.І.Канстанцінавіч, У.П.Раманоўскі, М.В. Шчасны. **1991**. Я.А.Гурыновіч, В.Я.Ермакоў, А.М.Кажэўнікаў, С.П.Казлоў, М.І.Новікаў, І.І.Пігальскі, А.П.Сторажаў, М.А.Сякерыч. **1992**. П.В.Какорка. **1996**. М.С.Лескавец, В.П.Палкін, А.А. Шахлевіч. **1997**. М.З.Варонін, М.Дз.Дадзько, А.А.Пахомаў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ МА́ЙСТАР ПРАФЕСІ́ЙНА-ТЭХНІ́ЧНАЙ АДУКА́ЦЫІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася за выдатныя поспехі ў галіне прафес.-тэхн. адукацыі майстрам вытв. навучання тэхн., гар. і сельскіх прафес.-тэхн. вучылішчаў, інспектарам рэсп. і абл. упраўленняў прафес.-тэхн. адукацыі, якія маюць стаж работы ў сістэме не менш за 10 гадоў. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 30.8.1956, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. З 29.10.1971 устаноўлена званне *заслужаны работнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларускай ССР*.

Заслужаныя майстры прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларускай ССР

1957. В.М.Жукаў, М.Г.Карпасаў, М.Р. Клімкоў, Л.А.Плаксаў, Б.А.Рудой, І.І.Сіповіч, Р.І.Харытонаў. **1965**. М.М. Агаркоў, Л.М.Балдоўскі, М.П.Бурносаў, І.М.Васючэнка, Я.Н.Гаўрыльчык, В.А. Глушчэня, К.К.Елачкін, П.В.Жаркевіч, А.М.Зубрыцкі, Б.І.Ігнатовіч, П.В.Казлоўскі, Ф.М.Канабяеўскіх, Дз.В.Каравацкі, М.Дз.Кісялёў, С.І. Клімковіч, І.А.Корзун, С.А.Кот, П.А.Кошаль, В.І. Малчанаў, М.К.Манулік, М.П.Молчан, І.Р.Нікіценка, З.А.Патапенка, І.Я.Перагуд, В.Л.Прусак, А.С.Прыгароў, В.Ф. Прэнз, С.К.Сініла, А.П.Туманаў-Сакалоў, А.І.Хадарэнка, М.А.Чура, У.І.Чысцілін, А.Ц.Чэпікаў, І.Т.Шайтур, М.І. Шыянок. **1967**. А.К.Асмалоўскі, Т.А. Баркун, В.І.Валадзько, І.А.Германовіч, Л.Я.Жадан, Ф.І.Жышко, С.В.Кавалеўскі, У.П.Кавалёў, С.В.Карэлін, М.І.Красаўцаў, П.І.Кузміцкі, А.А.Лазічны, А.Ф.Ляшко, С.У.Міхайлец, П.А.Міцюль, Я.М.Оберман, В.В.Позняк, І.А.Рыжанкоў, П.Ф.Свістуноў, Л.І.Спіцэвіч, У.М.Тарасенка, М.П.Хальчыцкі, В.К.Цяўлоўскі, А.М.Шагінава, В.Ф. Шасцітка, М.У.Якуш. **1968**. П.А.Кавалёў, Н.М.Качаноўская, І.І.Ляшчынскі, М.М.Полх, М.С.Тапырык, І.А.Ціханенка, С.І.Шэйн, В.Дз.Шчалухін. **1970**. М.П.Аксючыц, В.С.Більдзюкевіч, Л.Я. Буцько, Г.Ц.Гуеўская, Г.М.Карпава, У.С.Лугоўскі, В.І.Пернікаў, І.І.Рудэнка, А.А.Сабалеўская, М.Ц.Смалякоў, У.Я. Стрэдуб, А.І.Юшкевіч.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ МАШЫНАБУДАЎНІ́К БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным рабочым асн. прафесій, майстрам, інж.-тэхн. і навук. работнікам прадпрыемстваў, аб'яднанняў, н.-д., тэхнал., праектна-канструктарскіх і інш. арганізацый машынабудавання, прыладабудавання і радыёэлектронікі і Дзярж. Камітэта стандартаў СМ СССР, якія бездакорна прапрацавалі ў гэтых галінах не менш за 10 гадоў, зрабілі вялікі ўклад у развіццё ўказаных галін прам-сці, у стварэнне новых машын і абсталявання, што адпавядаюць патрабаванням вышэйшай катэгорыі якасці, і на аснове ўкаранення ў вытв-сць дасягненняў навукі і тэхнікі дабіліся значных поспехаў у выкананні вытв. заданняў і сац. абавязацельстваў, паляпшэнні якасці прадукцыі, павышэнні прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытв-сці, а таксама ў справе стандартызацыі і метралогіі на прадпрыемствах названых галін прам-сці і прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 11.5.1978 прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР. Існавала да 23.11.1988.

Заслужаныя машынабудаўнікі Беларускай ССР

1978. Я.М.Аляксеенка, І.М.Буслоў, У.Ф.Воўк, П.П.Гайдэнка, Г.В.Гарбуноў, І.К.Казлоў, В.Ф.Кебіч, І.У.Курбацкі, А.Ф.Лашук, В.Дз. Леўчанка, Г.А.Трафімчук, В.С.Чубараў, В.С.Шахноў. **1980**. А.А.Анісімаў, М.Л.Афанасенка, М.Дз.Бусел, С.Ф.Глекаў, П.К.Кавалёў, А.Р.Каляда, А.Х.Кім, А.П.Кузняцоў, Э.А.Кункевіч, А.Х.Ляфараў, В.А.Насенка, М.А.Пакідзін, У.І.Пяткевіч, В.А.Саўпель, А.П.Таракін, І.І.Шкаруба. **1981**. І.С.Кашаленка, У.А.Крэньцікаў, П.Р.Старавойтаў. **1982**. П.В.Зыль, В.Л.Тамашэвіч, П.Ц.Хацько. **1983**. М.М.Косцікаў, Ш.Я.Рубінштэйн. **1984**. У.І.Акуліч, М.П.Доўнар, М.Ф.Лаўрыновіч, М.Я.Маханёк, В.С.Рудніцкі, А.П. Сакалоў. **1985**. М.Ф.Гарбуноў, А.В.Гаўрыльчык, І.Х.Кірыльчык, У.В. Радкевіч, М.І.Цюрын. **1987**. У.І.Асіпок, К.Я.Гадасік.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ МЕЛІЯРА́ТАР БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным інжынерам-меліяратарам, тэхнікам-меліяратарам, механізатарам меліярац. машын і інш. работнікаў меліярац. прадпрыемстваў і арг-цый, калгасаў, саўгасаў і н.-д. устаноў, якія працавалі па спецыяльнасці не менш за 10 гадоў і мелі вял. заслугі ў галіне праектавання, буд-ва і эксплуатацыі меліярац. сістэм і высокаэфектыўнага выкарыстання асушаных зямель. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 7.3.1963 прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР. Існавала да 23.11.1988.

Заслужаныя меліяратары Беларускай ССР

1964. А.Р.Віктаровіч, С.Л.Касцюк, І.А. Поліўка. **1965**. Б.У.Астаповіч, У.Я.Байдачэнка, В.І.Барысік, Л.І. Бянько, Б.І.Дубро, П.А.Запольскі, А.Б.Ігнатовіч, М.М.Макась, П.І.Тумар. **1966**. А.С.Вярхоўскі, Л.Ц.Калеснік, А.І.Корза, А.П.Летуновіч, Д.Ф.Райшаў, П.І.Шчытнікаў. **1968**. І.І.Горбач, П.М.Далматовіч, І.С.Долбік, В.І.Жукаў, Я.Ф.Кабакоў, Э.Х.Кажухіна, М.Дз.Клімаў, К.М.Ласко, Л.Ц.Ляткоўскі, І.А.Пажарыцкі, Я.П.Сарагавец, П.С.Саянкоў, М.М.Сурма, В.Ф.Шабека. **1971**. В.Ф.Пастухоў. **1973**. А.С.Кавалевіч, А.Т.Кароткі, М.П.Каспяровіч, П.Дз.Качубей, В.М. Кульбянкова, М.Я.Курзянкоў, М.М. Матус, М.А.Некрашэвіч, Я.Р.Нікалаенка, П.К.Парчэўскі, У.С.Рабаў, В.Р.Селіванюк, Б.І.Цімафееў, К.Н.Чыркаў, П.А.Шчукін, М.Р.Мурашка. **1975**. У.І.Зайцаў, І.М.Камовіч. **1976**. П.С.Горбач, М.Е.Казлоў, В.І.Калугін, У.І.Палынскі, Я.П.Траян, М.К.Хадорчанка. **1977**. А.М.Раманенка. **1978**. І.П.Брыгідзін, К.Я.Бутанаў, А.Р.Вілюга, Л.А.Касцюк, С.І.Кругленя, А.Р.Шарафановіч, В.В.Ярмоленка. **1980**. Р.І.Афанасік, А.І. Міхальцэвіч. **1983**. Э.А.Камінскі. А.І. Хрыпанкоў. **1985**. А.А.Зеляноўскі, В.М.Свірыдзенка. **1987**. І.Дз.Кандрацьеў, В.П.Каролік.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ МЕХАНІЗА́ТАР СЕ́ЛЬСКАЙ ГАСПАДА́РКІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным інжынерам і тэхнікам калгасаў, саўгасаў, машынарамонтных майстэрняў, н.-д. устаноў і інш. с.-г. прадпрыемстваў, устаноў і арг-цый, якія працавалі ў сельскай гаспадарцы па спецыяльнасці не менш за 10 гадоў і мелі вял. заслугі ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 28.3.1961, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 23.11.1988.

Заслужаныя механізатары сельскай гаспадаркі Беларускай ССР

1962. М.К.Бандарук, М.А.Бруханскі, У.П.Кот, У.А.Купцоў, Ц.Ц.Радчанка, Л.М.Рай, Н.А.Цэд. **1963**. Л.І.Балабановіч, В.Д.Белянкоў, А.М.Булыгін, І.Р. Грыневіч, А.І.Даронька, Я.М.Дварэцкі, Г.Д.Каліва, А.А.Паўлоўскі, М.В. Рудэнка, І.М.Сярэдзіч, А.А.Худзякоў. **1966**. В.В.Аніскін, І.П.Еўтухоў, А.П. Ліпніцкі, С.М.Малашэнка. **1967**. С.А.Байгот, У.Я.Дзятлаў. **1968**. Я.Р.Арановіч, В.М. Белілавец, Ф.А.Брыкет, Н.А. Булавацкая, А.С.Валатоўскі, Л.В.Васільеў, А.В. Верабей, Я.К.Дубоўскі, Г.П.Жолудзеў, Ф.І.Іваноў, А.Ц.Івашчанка, В.Г. Капуста, Т.С.Кобрусеў, Г.М.Козел, Р.М.Лазар, В.Н.Мазурка, А.Р.Макаганюк, А.Ф.Малочка, Р.В. Мацвееў, І.С.Мінц, М.В.Назарэнка, У.М.Пятух, Г.І.Рабушка, І.Дз.Разумаў, В.М.Рацкевіч, І.І.Салей, І.А.Сплендэр, П.В.Старавойтаў, А.А.Сушкевіч, У.М.Сцежкін, І.С.Шкурапацкі, Р.С. Шпак, С.А.Якерсон, І.І.Яўціхіеў. **1969**. К.М.Дубоўскі. **1970**. М.Р.Рашацян, І.А.Чыкілеўскі. **1978**. Я.І.Галухін, М.А.Караткевіч, К.І.Праканоўіч, В.І.Савіцкі, С.Я.Трафімаў, Я.К. Шацкі. **1980**. В.А.Гідрановіч, У.С.Здраўцоў, М.А.Зялёны, М.Дз.Казакоў, Ф.У.Малахаў, М.С.Паходаў, А.Л.Стрыжычэнка, А.А.Шлапакоў. **1985**. У.П.Ганчарык.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ НАСТА́ЎНІК ПРАФЕСІ́ЙНА-ТЭХНІ́ЧНАЙ АДУКА́ЦЫІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася за выдатныя поспехі ў галіне прафес.-тэхн. адукацыі выкладчыкам тэхн., гар. і сельскіх прафес.-тэхн. вучылішчаў, інспектарам рэсп. і абл. упраўленняў прафес.-тэхн. адукацыі, якія маюць вышэйшую адукацыю і стаж работы ў сістэме не менш за 10 гадоў. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 30.8.1956, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. З 29.10.1971 устаноўлена званне *заслужаны работнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларускай ССР*.

Заслужаныя настаўнікі прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларускай ССР

1957. М.Р.Міхневіч, А.Ф.Мозерава, М.Дз.Пракоф'еў. **1965**. М.М.Арэхаў, А.П.Балейка, У.І.Бараноўскі, В.А.Галанкова, Н.М.Гардзіенка, Я.Я.Грыгуць, М.Ф.Гукаў, В.В.Дамашова, Я.Г.Данільчык, І.Д.Дворкін, Л.К.Забалотнікава, М.А.Каліта, У.І.Крывашэй, Я.Р.Курдзюкоў, М.Х.Лазараў, М.А.Лісьцын, Л.В.Натараў, У.А.Небальсін, Л.М.Панамарова, М.Г.Пераплётчыкаў, К.Я.Плаўнік, Р.Ф.Рэшчыкаў, Р.М.Смерціна, Н.Л.Смірнова, В.Т.Суворaў, Ф.Я.Шайдураў, У.В.Ягораў, І.Б.Якаўлеў, С.М. Яфімаў. **1967**. У.С.Бішкірэвіч, М.А.Быкоўскі, У.К.Бычынаў, Л.В.Ведзяняева, Я.І.Верашчагін, М.А.Давыдзенка, М.І. Добін, Х.А.Котава, Р.Р.Кучук, А.В. Львоў, Дз.Р.Лявіцкі, Б.А.Міткін, В.П.Міхалковіч, С.М.Муркоў, Я.С.Пагарэлы, В.І.Пятрова, М.І.Раманаў, Я.В. Сікорская, А.І.Цітоў, С.Я.Шарупіч, П.І.Якімаў. **1968**. А.С.Зайцаў, А.І.Куранцова, А.Я.Ларын, Ф.К.Латынцаў, Н.М.Лукошка, Г.М.Лявончанка, М.Г. Макулік, В.П.Марушчак, М.П.Новікава, Н.Г.Салаўёва. **1970**. М.П.Аронаў, Г.І.Бацяноўская, Я.С.Бергер, А.М.Вацечкін, А.А.Камяйкоў, Е.К.Мельнікава, С.П. Пархімовіч. **1971**. А.З.Рыкаў, А.Т.Якубенка.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ НАСТА́ЎНІК ПРАЦУ́ЮЧАЙ МО́ЛАДЗІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася ў 1976—81 высокакваліфікаваным настаўнікам прац. моладзі за вял. заслугі ў навучанні юнакоў і дзяўчат прафес. майстэрству і выхаванні ў іх камуніст. адносін да працы, высокіх ідэйных і маральных якасцей. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 10.6.1975.

Заслужаныя настаўнікі працуючай моладзі Беларускай ССР

1976. І.Д.Кур'ян, В.І.Палонік, Г.М.Рагіла, М.В.Тоўсты. **1977**. М.М.Абраменка, М.І.Балеў, У.П.Босы, В.Ц.Дудзіна, І.І. Іваноў, І.Т.Касьянюк, С.Ю.Навумік, В.Х.Падашэўка, І.Я.Парфёненка, Л.В. Сакоўскі, Л.А.Тозік, У.Л.Швароў, Б.Б. Юзафовіч. **1978**. В.П.Булава, А.Л.Валодзін, Н.А.Васілюк, Н.У.Дарашэвіч, В.Е. Дзенісенка, М.В.Дзямідаў, Л.А.Дзятлава, Л.М.Дзяцел, Р.С.Іваноў, Д.М.Кавалёва, П.К.Кавалёў, А.Р.Казячы, Р.М.Канстанцінава, М.Т.Клімаў, Я.І. Клімчанка, А.А.Ключнік, М.У.Красоўская, А.Л.Лемеш, Ф.Ф.Матэуш, М.Ф.Мініч, В.М.Мінькова, Н.Т.Пятрэнка, Я.П.Салаўёў, Л.М.Станкевіч, П.Д.Сялюк, В.М.Ткачэнка, М.І.Уткін, П.С.Шчарбакоў, Я.С.Шэлепава, У.П. Яршэвіч, У.А.Ясцюгоў. **1981**. В.А.Абраменка, А.А.Байкоў, Л.М.Беляковіч, Ц.Р.Бойка, Т.М.Бублей, М.М.Буртыль, В.Ф.Бялоў, А.У.Вазап, Н.П.Галоўкіна, В.І.Гаўрылаў, І.Г.Даманскі, М.К.Дарошак, Я.В.Дзядовіч, І.І.Дудзянкоў, В.К. Зелянко, Л.І.Зімагорава, М.Т.Козел, А.У.Комар, В.Р.Ладанёў, Р.Я.Лукашэвіч, І.Я.Магонаў, С.І.Майсеева, В.Н. Мартыненка, В.Д.Махновіч, А.А.Нікалайчук, І.І.Палякоў, В.А.Пятроў, В.А. Скрыпнік, М.В.Цегерава, Ц.П.Чарнова, М.М.Шпігель.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ НАСТА́ЎНІК РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. настаўнікам, выкладчыкам, выхавальнікам і інш. работнікам дашкольных устаноў, агульнаадук. устаноў усіх відаў, устаноў пазашкольнай і прафес.-тэхн. адукацыі, дзіцячых дамоў, якія працуюць па спецыяльнасці 15 і больш гадоў, за заслугі ў пед. і выхаваўчай дзейнасці, што забяспечвае атрыманне навучэнцамі і выхаванцамі глыбокіх ведаў, развіццё і ўдасканаленне іх творчага патэнцыялу. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. У 1940—88 існавала званне засл. настаўнік Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя настаўнікі Рэспублікі Беларусь

1941. М.А.Акульміна, Н.Ф.Арлова, Я.В.Астроўскі, М.С.Арцюхоў, П.І.Біран, В.С.Бірыч, М.І.Гайсёнак, А.Г.Гарачун, А.С.Дарашчанка, К.А.Зайцава, І.К.Зіновіч, М.І.Канавальчыкаў, І.Г.Крукоўскі, А.Ф.Крылова, А.С.Крыцкая, Э.А.Лютарэвіч, Г.В.Макарава, П.С.Нікалаенка, А.Р.Нікіценка, Х.Р.Пранік, У.П.Пушкарэвіч, П.І.Сівой, Н.І.Сіўко, Д.К.Талкачоў, Г.В.Харытановіч, А.А.Шаплыка. **1944**. І.М.Галынец. **1945**. В.Р.Адзінцова, К.В.Асмалоўская, Н.Г.Афанасьева, П.А. Бабіцкі, К.А.Барысевіч, Ю.І.Букатая, К.А.Бурдзілава, І.С.Вадэйка, Л.Г.Валачковіч, П.С.Васілеўскі, В.Л. Вільтоўская, І.П.Вольскі, А.П.Воранава, П.С.Вяндзіла, М.М.Гаваркоў, Г.П.Гілевіч, Я.Р. Грыгор'еў, Л.В.Грынаўцова, Г.Л.Дзівак, А.К.Дзяруга, Е.С.Елісеева, Н.П.Жукаў, А.І.Іваноў, М.А.Кавалевіч, М.К.Кандрацьеў, І.У.Капаевіч, А.А. Кармалітава, В.Ц.Карпенка, Г.І.Катлінскі, А.М.Кісялёва, К.Ф.Коршук, Б.Р.Крупадзёраў, В.С.Кузьміна, В.М. Кунько, Б.М. Лаўрыновец, В.І.Ліяранцэвіч, Т.А.Лютароўская, М.С.Магільніцкая, П.Л.Макарэня, Ю.А.Марозава, З.П.Мірoненка, С.А.Нікіцін, Н.Я.Паднясінская, М.Ф. Паніткова, Б.А.Петрашкевіч, М.М. Пруднікава, В.А.Прэйс, М.Р.Разоўскі, А.Н.Салоха, В.А.Самцэвіч, І.А.Сасіновіч, Г.К.Севярнёва, Я.У.Семяноўская, Н.І.Слайчэўская, М.Ф.Старычонак, М.М.Сяргеенка, Я.А.Федчанка, А.А. Чаркас, А.Б.Чарноў, П.А.Чуліцкі, І.П.Шаплыка, Н.В.Шыдлоўская, А.А. Яўнас, Е.С.Яўсеева. **1946**. Ф.С.Голуб. **1947**. Я.Г.Абросава, В.С.Бандарчык, М.С.Баразнёнак, Р.Р.Барам, Л.М.Белавусава, Г.Р.Блаў, А.М.Былінская, А.А.Васілевіч, Дз.А.Вінаградаў, І.А. Гальчук, М.П.Гапановіч, В.С.Гарбацэвіч, М.Б.Голуб, Р.М.Гуткоўскі, М.Р.Дамарацкі, А.Я.Дарашэвіч, В.А.Дашук, І.А.Дзешчыц, С.С.Дзіковіч, П.І.Дубінін, Н.Я.Жыльчык, А.І.Ігнацьева, С.А.Казак-Цяста, Л.М.Казлоўская, А.І.Калістратава, А.С.Карась, Г.М.Кац, А.Н.Котаў, Г.К.Кузняцоў, Е.В.Лазарэтава, Н.М.Лапушанская, П.М.Лепяшынскі, М.І.Лобан, П.С.Лубяка, А.І.Львова, Г.Ф.Лявонава, А.Я.Мажэйка, І.А.Пісарчык, Е.С.Прэйс, Я.М.Разумоўская, Т.Ф.Сапелкіна, І.А.Скрынікава, А.Н. Стахоўскі, Т.П.Сцяшковіч, П.П.Фядотаў, Г.У.Хадоска, А.Г.Цыкуноў, З.А.Чарнагорцава, М.Ц.Шабураў, С.Ф. Шаснеўская, А.А.Шаўко, П.П.Шымановіч, М.К.Яновіч, Г.А.Ярмусік. **1949**. М.М.Азараў, Т.І.Азёрнікава, У.К. Азёрнікаў, А.Г.Александровіч, Я.В.Андрэева, К.А.Арлова, В.П.Арлоў, Д.Д.Арцямюк, Я.М.Баранава, А.П.Балтрушэвіч, В.І.Бальшова, Г.М.Буланчыкава, І.Р.Вадэйка, Ю.В.Валавікова, Г.А.Варановіч, В.П.Васілеўская, Л.Я.Васільеў, К.М.Весяліцкая, К.М.Вярыга, Л.А.Вяткіна, З.І.Дарашэвіч-Дынкіна, І.І.Жардзецкі, П.І.Забелін, К.М.Захар'яш, М.А.Казлоўская, А.П.Калецкі, Д.К.Карага, В.І.Кацяміра ва, І.І.Кмеша, Л.Т.Кур'ян, Я.Д.Кушнер, Г.М.Лабузноў, С.М.Латушка, Я.Г.Лахнова, М.І.Леанёнак, К.С.Лучкоў, Ф.Я.Лысянкоў, М.І.Малкова, К.І.Мілановіч, К.Р.Нікалаева, І.В.Папко, Ф.І.Раманюк, А.Ф.Рымараў, С.А.Сацэвіч, К.Дз.Севасцьянава, В.І.Смірнова, М.С.Стральчэнка, Я.І.Фанкевіч, М.І.Федчанка, Т.А. Хальпукова, М.Ф.Хальпукоў, І.Ф.Шаланкевіч, В.У.Шкарубская, І.А. Шмуляўцаў, К.П.Шчаглавітава, М.Я.Якушэвіч. **1950**. А.Дз.Базыка, В.Я.Высоцкая, П.Дз.Гагарын, В.А.Гусарэвіч, З.С.Жгун, З.І.Закржэўская, П.А.Клімковіч, Т.А. Красоўская, Н.А.Крыўцова, А.Ц. Навіцкая, І.П.Новікаў, В.П.Пучкоўская, Дз.С.Раздзёраў, Л.А.Ржавускі, А.М.Саламаха, А.П.Травулька, Я.М.Тэпо, М.Ф.Целяшоў, Р.В.Шакун. **1953**. В.С.Багдановіч, М.К.Беразоўскі, Н.В. Міхалковіч, М.Л.Раман, У.М.Самусік, Г.Г.Субоціна. **1954**. Ф.А.Азарава, І.Ф.Афанасенка, Г.В.Вайткевіч, З.С.Гуло, М.Ф.Гусак, В.Б.Іванчыкава, М.І. Пяшкоўская, У.П.Раздзялоўскі, Ф.С. Скеп'ян, Н.М. Талецкая, Ф.Н. Чаўновік. **1955**. Т.І.Аўчыннікава, С.Дз.Белы, Я.П.Бярэзіна, В.А.Варончанка, І.Р. Герман, В.В.Гурыновіч, Я.М.Дабратворская, Н.Я.Дарасевіч, А.Дз.Ермакова, З.П.Калашнікава, С.Дз.Кітовіч, М.П. Красоўская, П.П.Куяўскі, Дз.Ц. Лу-

шчаеў, М.Г.Мазінг, М.Ф.Марчанка, Р.Ш.Мендзелева, Н.І.Міцкевіч, Г.Р.Новікаў, А.А.Папоў, В.І.Савіцкая, М.Г.Сачнёва, У.С.Сліж, А.С.Смаршкова, А.М.Тычына, П.У.Хадоска, М.Р.Чарнышова, Н.А.Шамоўская, С.М.Шарабайка. **1956**. В.Л.Градзенчык, А.М.Дудар, Р.І.Жыглевіч, Р.А.Зылькоў, К.А.Каліна, Н.С.Пятроўская, М.У.Салоха, Н.І.Сінская. **1957**. У.Ц.Альфер, В.Ф.Альшэўская, С.С.Арлоўская, М.М.Арэхаў, М.М.Астраховіч, В.В.Багданенка, Т.А.Балтрукевіч, Дз.Ц.Басько, Д.В.Бекарэвіч, С.Г.Беланожка, А.К.Белашова, Н.Р.Бельская, І.Н.Булойчык, Ф.С.Бусел, Н.А.Быкоўская, В.У.Бяляева, Н.Д.Бярозкін, Л.П.Ванькевіч, Я.Н.Варонін, Дз.Я.Верам'юк, С.Л.Вестэрман, Я.І.Вігура, З.А.Вінаградава, Г.А.Вішнеўская, К.В.Волкава, А.С.Гайдаш, І.А.Грабцэвіч, А.А.Гуцько, Ю.Э.Дабражынецкая, К.С.Дабрынская, А.Я.Джэжорэ, І.К.Дзіковіч, А.І.Дробыш, А.С.Елісеенка, А.Ф.Ерафееў, А.В.Жлановіч, А.В.Жукава, Е.Ф.Жыгач, В.П.Зайцава, Г.В.Зайцава, А.І.Зайцаў, Н.К.Захарава, В.А.Захарошка, В.М.Зелянькевіч, Л.Ф.Знаменская, Дз.П.Івашка, Я.Н.Івашкова, К.Дз.Ігнацьеў, Г.М.Ісаева, Н.І.Ішчанка, М.А.Кавалёва, І.М.Казак, А.Р.Каласоўская, Дз.А.Карлоўскі, В.А.Карпінская, В.І.Касабуцкая, А.Ф.Качан, В.А.Кашыцкі, І.Дз.Кірэй, Г.П.Клейнава, А.Ш.Клябанаў, Ю.А.Краснова, С.П.Кузьма, К.Х.Кузьміцкая, П.П.Кучаравенкаў, М.П.Ладэс, В.Р.Лапіцкі, Ю.А.Лявоненка, К.Ф.Лявонцьева, Н.У.Ліпская, Я.П.Лосева, А.Р.Лукіна, К.С.Лукоўнікава, А.І.Ляшкевіч, П.Р.Мазалаў, В.П.Мароцкая, А.Ф.Мацкевіч, А.М.Меркуль, М.В.Мілава, М.П.Молчан, Т.І.Мурашка, М.М.Мядзведзева, Н.М.Мялкоўская, М.І.Нікіценка, С.С.Нікіціна, В.Я.Новікава, К.А.Новікава, С.Р.Новікаў, А.М.Падбярэзная, Н.В.Палікарповіч, І.І.Праліска, Н.У.Пратасевіч, В.А.Прачук, Г.В.Пуплікава, П.А.Пцічкіна, М.І.Пяткевіч, Н.Л.Рабчанка, З.В.Размыслова, З.І.Раманенка, Р.К.Рамановіч, С.Ф.Рубанаў, Г.А.Рудза, М.А.Рудкоўская, Л.А.Ружанцава, Е.І.Садкоўскі, А.П.Саковіч, В.І.Серапіна, Н.І.Случаноўская, Ю.В.Смаршкова, Г.К.Сталовіч, А.М.Субоціна, В.Т.Сцепаненка, К.П.Сцяпанава, А.І.Сычова, А.А.Сяргейчык, П.В.Тур, П.Р.Тышкевіч, Н.Я.Уласава, У.П.Фомчанка, М.Е.Францішаў, У.В.Фурсаў, М.А.Хадасевіч, Л.І.Хвалько, К.П.Цітавец, Н.В.Чарненкава, Н.Н.Шарай, М.П.Шаўчук, Н.М.Шляпіна, Г.С.Шумейка, М.Н.Шчэрбава, А.С.Якубчык. **1958**. В.П.Александроўская, К.М.Астахава, А.Г.Атрошчанка, І.Ф.Бабковіч, Е.Е.Бабыр, А.В.Багамазава, Т.А.Балабаеў, Д.Б.Баршчоўская, М.С.Бахаўчук, Н.С.Бейзарава, Г.Ц.Гардзей, В.Р.Дубровіна, К.С.Кавалёнак, Н.Е.Кацько, М.М.Крукоўская, Ф.К.Лагацкая, Л.М.Нікалаева, Г.І.Рэут, К.Ц.Садоўская, Р.В.Сазоненка, Н.Я.Саковіч, А.Ц.Сарокіна, А.Ф.Сасноўскі, А.І.Страпчанка, В.Л.Філютовіч, К.А.Шабека. **1959**. Н.А.Арол, М.Е.Арцем'ева, У.І.Баран, І.В.Барсукоў, В.І.Берзін, К.С.Бялова, І.К.Галіноўскі, Л.П.Гарбацкая, Н.А.Гарнакова, Л.В.Гітковіч, У.Дз.Грышановіч, М.П.Дарафеенка, М.Ф.Драбушэвіч, М.П.Дылёнак, І.І.Запрудскі, А.І.Зяновіч, М.У.Івашын, П.С.Кісялёў, С.А.Крэмез, Л.І.Лешына, К.С.Несцяровіч, М.С.Няронскі, З.М. Пакроўская, А.А.Парабковіч, Дз.С.Прыхожы, Я.Л. Ржавуская, К.Л.Старынская, Л.А. Талкачова, Ф.Я.Таран, М.Я.Францэвіч, І.Н.Храмцоў, М.Г.Цыбульская, М.А. Цымановіч, К.А.Шкляроўская, М.В. Шляхота, Т.А.Шпакоўская, Г.А.Шчэмелеў. **1960**. В.І.Адамовіч, Я.Ф.Анціпенка, Л.А.Асташкевіч, М.М.Аўчыннікава, Н.Л.Бабкова, М.П.Багамазава, Н.П. Бальшакова, Ф.М.Батурэвіч, Б.Л.Белкіна, М.І.Беціна, Е.В.Брусава, В.І.Буры, І.Д.Буяк, І.У.Бяляўскі, Н.У.Валькова, А.С.Васілеўская, В.М.Васільева, Ф.І.Велічкевіч, Н.Л.Вільтоўская, Т.С.Віткіна, Г.В.Волкава, Х.Я.Генкіна, В.І.Гіргель, Т.П.Гладкая, М.С.Грушэвіч, Н.В.Грыбко, М.Л.Грынкевіч, С.П.Гурын, С.П.Гурыновіч, Ф.М.Гуткоўскі, Е.П.Дайнека, М.І.Додалева, А.П.Драчылоўская, Г.П. Жук, В.Л.Жукоўская, В.В.Замыка, Я.І.Злотнік, А.А.Зюзіна, М.Я.Іванчыкава, Д.А.Казлоўская, М.І.Казлоўская, Н.К.Калантаева, К.І.Кандратовіч, А.П.Каралёў, Г.І.Карпюк, Н.І.Кевіш, Я.А.Кернажыцкая, В.І.Кляўз, А.А.Корбут, К.А.Корзун, А.Л.Крэз, Н.С.Кузняцова, Л.М.Кузняцоў, А.К.Кулініч, А.М.Куляшова, З.П.Лапата, М.І.Ліхач, М.П.Лучына, В.І.Лысакова, П.М.Лычкоўскі, М.А.Любанская, Н.А.Мажэйка, А.А.Майсейкава, П.І.Малаток, Г.К. Мальцава, С.В.Масько, В.І.Матросава, Г.І.Мацвеенка, М.П.Машкоўская, В.І.Мельнікава, Н.Н.Моніч, В.Ц.Мядзведская, Т.М.Назарава, М.У.Назарэнка, Г.І.Назіна, Е.М.Небрадоўская, Э.М.Некрашэвіч, В.Б.Нікольская, М.П. Ніценка, В.Я.Озераў, М.Г.Асіпава, А.Ф.Палішына, І.Ф.Палтарацкі, А.П. Панамарова, Л.Дз.Папова, Л.Ф.Парфёнава, А.В.Паўлава, Л.Я.Паўлюшчанка, А.І.Перагуд, М.В.Полаў, Я.В.Попала, М.П.Пусоўскі, А.У.Пятровіч, Г.К.Пятровіч, Н.С.Пятрэня, В.Я.Раманоўская, К.Ф.Рамашкова, А.І.Рачок, В.М.Рудая, А.В.Рыбская, А.І.Садоўская, Л.Г.Сакалова, В.А.Саўчанка, В.М.Семчанка, К.П.Славецкая, Н.Дз.Станкевіч, Г.Р.Ставер, В.В.Суша, С.Я.Сычоўская, С.І.Сяргееў, Х.Д.Тайманава, К.М.Тупкі, Л.П.Урагова, Ф.М.Уронская, П.М.Усціновіч, В.М.Храмовіч, В.А.Чувасава, М.Я.Шавельдзіна, Л.Е.Шаўлоўская, А.А.Шафарэнка, С.Д.Шмакава, Л.М. Шыкіравая, З.Г.Шынгель, Г.С.Шыянок, Э.А.Юшкевіч, М.В.Ядроўская, Н.І.Язерская, Я.Н.Ярмоленка, В.С.Ярэміна. **1961**. І.С.Салдаценкаў, Л.І.Чыстоўскі. **1963**. П.Л.Аленскі, Я.Ф.Анціпенка, Г.С.Апянчук, Л.Ю.Бань, Р.Р.Барысава, К.Л.Башаркіна, Ю.Н.Борда, А.А.Булат, К.Ц.Бялова, Я.А.Бярэзіна, С.М.Валодзін, І.М.Вашчылін, Н.Я.Ганчарова, К.П.Гарбялёва, М.Т.Глушнева, Г.А.Громава, В.А.Гудзень, М.М.Дудкіна, І.А.Ерафеенка, Р.І.Еўдакімчык, Г.А.Зарыцкевіч, Л.І.Зімацкая, К.С.Зінькевіч, Я.В.Зяблікава, В.Р.Іванова, В.К.Івашкевіч, В.В.Ізмайлаў, М.П.Ілынец, П.Ф.Ільюкевіч, В.І.Камандзенка, Г.П.Касякова, Ф.У.Кец, М.К.Князева, М.Б.Коласава, І.Ф.Крук, У.І.Кудзеліч, А.С.Кудраўцава, В.І.Кулікоўская, Р.Ц.Куляшова, М.М.Курловіч, М.А.Лісава, Н.Г.Літвінава, М.Ф.Лосеў, Н.І. Лысенка, Л.У.Ляшкевіч, Я.І.Маеўская, Ц.М.Меднік, А.І.Мілеўскі, А.Н.Мінкова, В.С.Мірановіч, А.А.Міткевіч, А.В.Міхайлава, І.М.Мурзаў, Н.Я.Набярэжнева, П.Н.Несцярэнка, В.Я.Пагужэльская, М.І.Пасюцін, Н.С.Пашэвіч, К.Ф.Пшонка, І.М.Пярэдня, А.І.Рамашова, А.Я.Рашэцька, І.С.Русаковіч, Н.Б.Савельева, М.В.Савічава, П.М. Свірка, М.М.Седранок, В.Дз.Семачкін, А.Р.Семяненя, Т.М.Сінельнікава, Л.П. Слепакурава, Н.Ф.Смірнова, М.А.Сталяроў, М.С.Старава, З.І.Студнева, Е.М.Сцепаненка, А.К.Тарайкоўская, Ф.В.Фёдараў, Н.Я.Цікунова, А.С.Чабан, В.Я.Чаранок, Н.І.Чэчыкава, Н.Л. Шаўрукова, Л.А. Штукар, Н.А.Шумілоўская, М.Ф.Шупейка, Р.І.Элькінд, М.Р.Юдава, Л.І.Язвінская. **1964**. Н.Е.Агароднікава, А.С.Адамчык, М.Я. Аляшкевіч, Н.Я.Андрэева, В.Л.Андрэйчыкава, М.М.Арарэй, А.З.Арэшка, М.І.Базылёва, М.К. Балвановіч, Н.А. Банцырава, М.М.Бардовіч, З.А.Баўбель, М.М.Бачыла, С.А.Белік, М.Я.Белянкоў, М.Б.Біскін, З.З.Бондарава, В.І.Брэцкая, І.А.Букрэеў, Л.М.Быстрэнка, М.У.Бяспалава, М.І.Валасевіч, М.І.Варанько, Л.Я.Васільева, В.К.Вернікоўская, І.Л. Гайманаў, В.П.Галавашына, В.С.Ганчарова, М.П.Гаранін, М.К.Гарбаценка, В.В.Гарбачова, Г.І.Генералава, Н.І. Грашнова, В.Ф.Грашчанка, Н.П.Гусінцава, К.П.Давідчык, Л.Дз.Дамарацкая, М.С.Данілевіч, М.А.Дзмітрыеў, Н.А. Еўдачэнка, І.В.Жук, З.Г.Жукоўская, К.П.Жураўкова, Л.І.Жыліна, М.М.Зарэцкі, Л.П.Звонава, С.М.Зубоўскі, Н.Дз.Зуева, Н.К.Зязюліна, М.Ф.Ільюшэнка, М.А.Кавальчук, Р.П.Казімірава, Г.Е.Казлова, В.І.Каленік, С.І.Калугіна, Л.Ф.Камароўскі, В.А.Кандрацьеў, Н.Ф.Капіч, М.А.Картузаў, В.С.Карцель, Т.І.Касцюкевіч, А.С.Кецко, Г.А.Кір'янава, В.Е.Клімовіч, В.Дз.Кляменценка, Т.Ф.Корж, Ф.Л.Крайнік, А.М.Красціна, М.М.Кудраўцава, В.П.Кукуруза, Г.І.Кунцэвіч, Г.А.Лабанок, Т.П.Лазарава, Л.І.Лайко, А.Т.Лебедзева, Н.М.Лебедзева, І.І.Луцаеў, Л.М.Любімцава, М.Ц.Макаева, Л.П.Малахава, В.Ф.Малышава, М.М.Манышаў, М.М.Марцінкевіч, М.М.Маторына, С.К.Мірановіч, А.Р.Міхалёнак, С.І.Мялешка, В.У.Навуменка, Н.А.Навуменка, А.М.Несцярук, В.М.Нікалаеня, В.І.Нікіфаровіч, Е.Дз. Новік, З.Н.Носава, В.Л.Някрасаў, М.М.Няпраўскі, В.Е.Паўлава, К.П. Паўлава, Л.Я.Паўлава, З.П.Петрачкоў, Г.А.Платонава, І.Ф.Пратасевіч, А.С. Пушкін, Т.В.Пушная, В.К.Раждественская, В.В.Ражкова, Л.Ф.Разгуляева,

В.І.Расінскі, В.І.Рузава, М.С.Рынкевіч, В.В.Рэгель, У.В.Савельеў, Р.М.Савіцкі, Р.У.Салаўёва, Р.І.Салдаценка, С.Д.Самушчаў, В.Ф.Самцэвіч, М.Р.Семяненя, С.Ф.Серапін, М.М.Сівакова, Т.Р.Сідарчук, А.М.Скавароднік, С.Т.Смялоўская, Н.Дз.Сокалава, Н.М.Сокалава, Н.А. Сосна, К.І.Стаброўская, Г.С.Стукалава, Л.Р.Суворава, М.М.Супічэнка, В.У.Сухавей, А.Я.Сцефаненка, М.М.Сянкевіч, М.І.Талейка, М.С.Талочка, Н.С.Талстая, І.Р.Тупіцын, Д.П.Уласава, Р.І.Ушакова, П.І.Фядоценка, Г.П.Хадкевіч, В.М.Хіль, В.Р.Цабкала, Н.М.Цітарэнка, Н.Е.Ціханава, В.А.Чанцава, А.М.Чарнякоў, Б.Я.Чорнабародава, В.Г. Чысцякова, С.П.Чэчка, М.М.Шайкоўскі, А.І.Шкурдзюк, Л.Я.Шляхціна, К.А.Шот-Чатовіч, Б.Б.Шумейка, К.Т. Шынкевіч, Н.А.Юркавец, В.А.Якушава. **1965**. Н.М.Агалец, Д.К.Анісімава, В.У.Антановіч, В.І.Архіпаў, М.І.Аўраменка, А.І.Бабарыкіна, Ф.У.Багдановіч, А.М.Балаболіна, В.М.Баліна, Е.І.Банчук, Н.Н.Барысава, А.М.Барысенка, І.Д.Бельская, І.А.Беразінская, Д.Ц.Бірулёў, Н.Н.Бірыч, Я.В.Бродскі, В.Р.Бязмозгая, П.Ф.Бяляк, М.В.Бярэзіна, В.І.Вайцянкова, А.Ф.Валюкевіч, Н.Н. Вараб'ёва, Н.А.Верамейчык, Е.І.Вішнеўская, К.І.Воранава, Г.А.Вырадаў, А.В.Галкіна, У.А.Гардусенка, П.М.Гарэлінкаў, К.І.Геаргберыдзе, Р.С.Гінзбург, У.А.Глінскі, В.М.Голубеў, К.Л.Грабайла, Л.Ф.Грынчук, Ц.А.Грычанок, А.Ф. Гудоўская, А.С.Гулевіч, І.Ф.Гуркоў, І.С.Данілаў, П.А.Данюк, Е.С.Дзеніскок, Я.П.Дзіканава, В.Дз.Дзмітрыеў, Х.А. Драбкіна, Г.І.Жураўская, М.І.Забродзіна, Н.К.Залужная, І.І.Захарэнка, Я.А. Зінкевіч, Е.Д.Іваніцкая, Г.І.Іваноўская, Б.В.Іванюк, Т.С.Ігнаценка, Г.С.Кавалёва, У.А.Казакевіч, А.І.Казей, І.С. Казлоў, Л.С.Казлоў, М.А.Кайрыш, С.В.Калачык, А.С.Калеснікава, М.М. Калістратаў, М.М.Калкоўскі, А.В.Качкоў, К.М.Кіявіцкая, С.П.Класоўская, В.Р.Ключынская, Я.В.Кляноўская, Т.М. Краўцова, А.А.Круцько, С.І.Ксянзоў, В.В.Кузьмін, М.І.Кузьміна, Н.Б.Куляшова, Т.М.Курдо, М.І.Курловіч, Л.А. Кустова, М.П.Куцапалава, Т.А.Лазарава, М.Я.Лазук, В.Ф.Ларыёнава, К.С.Лісоўская, П.Г.Ліхачоў, Н.М.Лугавая, Р.М.Лук'янчык, А.А.Мазанік, Г.А.Майсеева, Я.П.Малюгіна, В.П.Маркаў, А.А.Мароз, Л.А.Мартыненка, І.Ф.Марціновіч, В.І.Маціеўская, Г.С.Мельнік, К.І.Мельнікава, Н.Х.Міхальчук, З.У.Мурашка, М.В.Мурашка, Г.І.Мусакоў, Е.С.Мядзведзева, А.І.Мякішкова, В.С.Мяцеліца, К.Ф.Мяшкоўская, А.П. Некрашэвіч, М.Д.Некрашэвіч, А.А.Нікіфарава, Л.Дз.Ніціеўская, Н.С.Новікава, М.С.Орсіч, П.Я.Паграбной, С.С.Палейка, В.І.Палянскоў, М.А.Панцыраў, У.А.Парахневіч, А.І.Пасько, Г.П.Перапёлава, М.Ф.Петрыкевіч, А.І.Прадзедава, Е.М.Прохарава, В.Р.Прохарык, Я.І.Пушкарова, А.І. Ржэўская, М.Р.Рыбак, М.Ц.Рыжанкова, В.С.Рымдзёнак, Ф.С.Савік, А.М.Савошчык, Р.Ф.Самойлаў, Г.Ф.Сініцына, А.Ф.Сіранькоў, Л.І.Сіткевіч, Б.Ф.Сіўко, Г.А.Смірнова, Г.А.Сташэўская, М.Д.Сукачова, Л.П. Сухадольская, Л.Н.Сянкевіч, А.Ф.Трафімаў, М.У.Трыпуцін, К.С.Тышкевіч, Ф.М.Ус, Б.Д.Фалкіна, Р.Ц.Фугіна, К.А.Харкевіч, А.К.Цабкала, У.Ц.Цабо, І.Я.Цімашкоў, З.І.Чарапкоў, І.Н.Чаркасава, М.М.Шабурава, Л.М.Шапіра, Г.П.Шарай, А.А.Шаўчук, І.К.Шашэнька, А.П.Шнейдэр, Н.П.Шэмет, А.А. Эмінава, Г.М.Юхнавец, А.М.Якаўлева, С.С.Якаўлеў, К.В.Якімовіч, М.І.Якімюк, Я.Дз.Янчанка, В.Ф.Ясінская, Я.Ф.Ясноўскі, А.П.Яфрэменка. **1966**. А.А.Абрамовіч, А.Р.Адзінец, Дз.С.Акімава, Р.П.Акуліч, В.П.Аленькава, В.А.Алешын, Л.І.Анжыеўская, І.А.Апанасевіч, М.Р.Арлова, Ф.Ф.Аскерка, А.В.Асмалоўскі, У.Т.Аўсеенкаў, Л.Ф. Афанасьева, М.І.Ачкін, А.І.Бабкоў, В.М.Балашова, А.С.Бандарэнка, В.І.Бараноўскі, В.С.Барысава, В.І.Барысавец, Т.Р.Белякова, Б.Х.Берлін, П.А.Берташ, А.Р.Будзіловіч, З.С.Буракова, Н.І.Быкава, А.В.Валчок, Н.К.Валчок, В.Э.Варатынская, В.І.Васілеўская, І.Р.Васільева, Б.Т.Васкавец, А.М.Віннічак, В.І.Воранава, В.І.Вярсоцкі, А.П.Гавароўская, Э.А.Гакава, З.С.Галаніна, А.М.Галкін, К.В.Гарбачова, І.С.Гаруноў, Н.К.Гаўрыкава, П.С.Гершан, Г.А.Глуздакова, Б.С.Грачыха, М.С.Грынцэвіч, Г.І.Грышына, М.П.Гулевіч, М.М.Гуль, С.Р.Гушча, У.Ф.Далжанкоў, М.Г.Даманцэвіч, Э.М.Дамінікевіч, Е.Г.Дарафеева, У.А. Дарашук, Ю.І.Джасава, Я.П.Дземідовіч, П.Ц.Дзівакоў, К.В.Дзмітрыева, А.М. Дзмітрыеў, Э.М.Дзягілава, А.А. Дзядзюля, Ц.Ф.Дзянісаў, В.П.Драздоўская, К.І.Дунец, Д.В.Ерамеева, Л.Р.Ерафеева, В.І.Жадзейка, В.Ю.Жалкоўскі, В.І.Жарская, В.А.Жорава, М.І.Жураўская, В.Г.Жываглод, Н.І.Жыгмунт, Г.С.Забалотная, Н.М. Зантовіч, В.М.Зікунова, А.В.Зубец, Н.Т.Зуева, В.Я.Ігнатовіч, Н.А.Ігнатовіч, Т.А.Ільінская, М.М.Іоначкіна, В.Н.Ісаевіч, А.П.Ісаенка, М.Я.Кавалеўскі, М.П.Казакоў, С.Р.Казачонак, В.В.Канавальчык, А.Р.Кандратовіч, К.А.Канцавой, М.Д.Капеліёвіч, І.М.Капітан, М.Ф.Капскі, С.І.Карпечкін, Л.У.Кармалітава, Ю.І.Касабуцкая, С.П.Каткоў, З.С.Качарэўская, А.М.Качынскі, Я.І.Кашалёва, П.Р.Квашніна, Т.А.Кляпацкая, Н.І.Кобрына, А.М.Колас, М.П.Краўцова, Г.У.Краўчанка, В.А. Кротава, В.Л.Крушаніцкая, З.А.Кубіцкая, І.М.Кузін, Н.П.Кузіна, Т.А.Кузнечык, І.М.Кузьмін, В.М.Кузьміна, Н.С. Кузьмянок, К.А.Кукушкіна, В.Я.Кулакова, М.В.Курдо, У.Я.Курловіч, А.Ц. Курылін, Г.Я.Кутневіч, Л.С.Лабус, М.І.Лавер, М.М.Лазоўская, В.І.Лаленка, Г.М.Лапо, Т.А.Лапчынская, М.Ф.Ларыёнава, Г.Ф.Лашкова, М.Ф. Левановіч, В.С.Леўчанкава, Н.І.Ліпская, Н.І.Логінава, І.М.Лукашык, П.Ф. Лук'янскі, Е.В.Ляцко, Я.Л.Макаеў, Я.Ф.Максіменка, І.В.Малец, С.П.Малішэўскі, В.І.Малюк, Н.М.Манеўская, М.А.Маніс, Я.Г.Марцінкевіч, Г.М.Марчанка, З.І.Марчанка, Л.П.Масальскі, Я.Р.Маткоўская, В.І.Матус, М.А.Махачкеева, А.П.Мельнікава, М.А.Мельнікаў, К.М.Мікрукова, Л.У.Мілей, С.А.Мілун, М.А.Мінюк, С.Я.Міронаў, Дз.С.Мішкуцёнак, І.А.Музычкін, Е.С.Мяжэнін, В.С.Навагран, В.Р.Навумаў, А.С.Налягач, Н.П.Новік, С.П.Нярэціна, К.Б.Падольскі, Л.М.Пазнякоў, Н.В.Пакроўская, Е.П.Палоўнікава, М.І.Палтарацкая, Т.Ф.Палхоўская, С.Г.Папова, В.А.Паташкоў, Н.Дз.Паўлава, З.С.Пачкаева, І.І.Пашкоўская, Я.В.Перавозная, П.С.Пехцяроў, А.І.Печкурэнка, С.А. Піскунова, Н.Г.Пляханава, У.Ф.Праневіч, М.І.Пырачкін, М.М.Пятрэнка, Ф.С.Рабічка, В.Я.Раманава, Р.М.Раманенка, Г.Х.Раманькова, Р.Ф.Растаргуеў, В.Р.Рашкевіч, В.І.Рымашэўская, М.Л. Рэлес, Л.М.Садоўская, М.Н.Саковіч, М.Г.Сарагавец, В.В.Секержыцкая, В.І.Семяновіч, М.А.Семяняка, Г.М.Серабракова, М.С.Серада, А.М.Сеўба, І.У.Сівак, А.В.Сімакоў, В.М.Скотнікава, К.М.Скробаў, С.Г.Славінская, Т.В.Славінская, І.І.Смарыга, Г.М.Сопель, М.М.Станкевіч, І.А.Станілевіч, М.П.Старыковіч, А.Дз.Страўе, М.Ц. Стэльмах, Л.Б.Суле, Г.С.Сухадолец, М.Ф.Сцепанькова, К.М.Сцёпін, А.В. Сялюгін, Т.А.Тарасевіч, А.Я.Точын, А.М.Троцкая, Р.М.Туравец, З.І.Удальцова, А.В.Уласава, Г.І.Усольцава, М.А.Фалейчык, М.М.Федасенка, З.Л. Фенчанка, М.К.Фешчанка, І.М. Фёдараў, Г.П.Філіпава, У.І.Філіпенка, А.П.Фінскі, М.І.Хадаронак, С.Р.Халяўка, А.А.Хандожка, С.М.Хацьянаў, Л.В.Цімаховіч, Г.Е.Ціханава, М.Н.Цыбірова, К.В.Цыбулька, М.С.Цяслюк, С.Р.Чакмарова, Л.П.Чарткова, В.Дз. Шавялёва, П.І.Шадурын, А.Дз. Шайтэр, Е.М.Шамшурава, М.А.Шамкавяк, А.П.Шацікава, П.А.Шыбаева, А.П.Шышонак, Н.І.Юрцэвіч, В.С.Юферава, В.В.Язвінскі, Л.В.Якаўлева, Г.Дз.Яроміна, Д.В.Яфрэмава, Р.М.Яфрэменка. **1967**. П.Н.Абушкевіч, В.С.Агароднік, Т.П.Адамовіч, Г.П. Адамчык, Н.Ф.Азарава, М.Б.Аксельрод, А.І.Акуліч, Г.П.Алекса, З.І.Альхімовіч, А.М.Аляксееў, В.Ф.Амплейкін, Т.А.Андрэева, А.С.Анісімава, К.П.Антонава, Г.Л.Арлоўская, Л.І.Арлоўская, Н.Ф.Асінская, Л.Л.Асоўская, Л.Н.Астафурава, М.Р.Атрашонак, Н.В.Аўраменка, П.М.Багадзяж, Я.Е.Багатырова, А.І.Базылевіч, В.В.Бакунова, В.Ц.Баранава, Т.І.Барсток, А.С.Барысенка, В.І.Барысовіч, А.П.Берасцевіч, Б.З.Бодніч, Г.П.Бохан, Ф.І.Браноўская, В.К.Брыкін, Л.І.Буйневіч, М.І.Булан, І.М.Бурдзіна, Дз.С.Бяклемішаў, В.А.Бяліцкі, К.Л.Ваньковіч, К.С.Вараб'ёва, А.П.Васільеў, Г.А.Верамейчык, К.А.Віктароўскі, Віяна Гомес дэ фонсеа Харарда, Г.Ф.Воранава, І.М.Воюш, В.Р.Вялічка, Ф.А.Вярцінскі, М.В.Вяршкова, Э.С.Вярыга, К.П.Вятрова, Т.Ц.Гагалінская, Л.П.Гажэнка, Р.Р.Ганжураў, З.В.Гарадзецкая, Л.А.Гарадзецкая, Н.П.Гарбачова, Л.Г.Гарбузава, З.І.Гардзейка, М.К.Гардзіенка, Е.А.Гарнізонава, В.В.Гарох, Я.В.Гарэцкая, В.Р.Гатальскі, І.Г.Гаўрылаў, М.М.Генкіна, В.С.Герасіменка, Л.Дз.

Герасімовіч, У.А.Германовіч, К.С.Главінская, З.А.Гладоўскі, У.І.Гляцэвіч, Л.А.Гніларыбава, М.Н.Горбач, Б.З.Гордзін, А.П.Грамыка, Л.А.Грахоўская, Т.П.Грысюк, М.М.Грыцкевіч, А.М. Грышкіна, М.Я. Гузман, П.А.Гулько, А.Р.Давыдзько, Г.І.Дайнека, Л.В.Дайнека, Г.А.Далецкая, А.А.Дамарацкі, І.П.Дзегялевіч, Р.П.Дзяйкун, Л.І.Дзялендзік, І.Ц.Дзямідаў, М.І.Драека, Ц.В.Дражын, Л.А.Драздова, С.П.Дрангоўскі, Г.І.Дуранкова, Ц.Р.Евельсон, Г.М.Емяльянава, М.А.Еўдакімаў, І.М. Жарыкаў, В.Г.Жук, У.С.Жук, Н.Я.Жукава, Н.А.Жыгарова, К.Ф.Жыгунова, А.Г.Жыткевіч, Г.Д.Зарачанская, С.М. Затоненка, М.П.Зыль, К.А.Іванова, Н.Т.Іванова, Р.М.Іванова, Л.Дз.Іванькова, В.Дз.Івашына, З.А.Іонкіна, К.Р.Іўковіч, А.В.Каваленка, Н.П.Кавалёва, Т.Л.Кавалёва, В.З.Кавалёў, Р.Б.Кадзін, В.У.Кадышаў, У.К.Казакова, К.М.Казьміна, П.Я.Каленчыц, В.А.Калінава, Н.А.Камарова, Н.В.Камарова, Ф.А.Камарова, В.П.Камароўская, Я.С.Кананюк, М.А.Капусціна, К.А.Каратай, І.В.Карнееў, А.П.Каршуноў, Н.А.Касабуцкая, А.А.Касабуцкі, Н.Ф. Катлярова, М.І.Кірылаў, Ф.С.Кісялёва, С.А.Клокаў, Г.Н.Клепча, П.В.Конанава, І.А.Корбан, М.А.Корнева, Н.Я.Коцікава, М.М.Красненкаў, В.А.Красуцкая, М.С.Круцікаў, Н.С.Круцько, А.М.Кузняцоў, М.А.Кулагіна, В.П.Кулай, А.П.Курганскі, К.А.Кухарэнка, Н.І.Лабанава, Ф.К.Лагутаў, Н.М.Ламакіна, Г.К.Ламшэўская, Н.А.Лаўрэнава, М.А. Лебедзеў, У.А.Лебедзеў, Н.І.Левін, С.І.Леўчык, А.А.Лешчына, Л.Ц.Ліхачэўская, Г.М.Лугаўцова, М.І.Лунь, Л.І.Любецкая, Л.У.Лютко, А.А.Мазалька, З.В.Макрыца, М.І.Максіменка, К.С.Малахава, М.В.Малышава, А.І. Маркаў, С.Р.Маркевіч, І.І.Мароз, М.М.Мартынаў, Н.В.Маскалёва, А.М. Маталыцкі, А.А.Мельнікава, Г.Р.Мельнікава, В.Дз.Мельнікаў, М.К. Мерабішвілі, Р.С.Мінчанка, М.М.Мірончык, М.В.Мірыцкі, С.В.Місяюк, В.В.Мурашка, В.У.Мурашка, Н.А.Мяшкова, Г.І.Набокіна, М.В.Навіцкая, Г.А.Немагай, А.Л.Новікава, В.К.Новікава, А.Дз.Нядзведская, А.Ф.Нячаеў, М.Г. Ойстрах, Г.І.Осіпава, Л.І.Пакаташкін, Н.В.Палавінка, Я.А.Палішчук, В.А. Панамарова, М.І.Панасюк, В.С.Панцялеева, Т.П.Паплаўская, І.І.Папоў, П.С.Патапейка, З.Ф.Паўлоўская, М.П. Пацёмкіна, І.Я.Петраш, А.А.Пігулеўскі, Н.А.Платко, Л.П.Пракоф'ева, С.І.Праўко, М.Р.Прывалава, В.М.Прышчэпчык, Л.В.Прэйс, П.П.Пукала, У.І.Пуцееў, М.В.Пушкарова, У.А.Пятроўскі, В.Я.Пячаткіна, І.М.Равуцкі, Л.Дз.Раманенка, Э.А.Рапапорт, А.І.Ратковіч, А.Ц.Русакоў, Е.Ф.Савельева, Н.А.Савіцкая, Р.І.Садкоўская, Н.Д.Сазонава, У.Дз.Салавей, А.І.Салаўёва, Ф.П.Сапроненка, А.М.Сасноўская, Л.В.Сасноўская, У.М.Саўко, П.П.Сачыўка, М.Я.Свірыдзенка, Ц.Т.Свістуноў, М.С.Селіверстава, М.У.Семак, Ф.І.Семчанка, М.А.Семянкова, А.М.Семяновіч, Г.У.Сіліч, Н.А.Сілкіна, П.П.Сінякевіч, Ю.А.Скварокоўская, Л.І.Скварцова, Т.В. Скібіцкі, Л.І.Скокава, В.М.Станкевіч, А.Ф.Старавойтава, В.П.Старавойтаў, Н.Г.Строк, Н.І.Суворава, Л.А.Сцефаненка, А.І.Сцешыц, В.С.Сцяпанава, Г.Ц.Сцяпук, Г.А.Сяльскова, А.С.Сямашка, Г.М.Таганоўіч, В.М.Такарэўская, Н.М.Тамарава, Т.П.Тамашэвіч, Б.В.Таранчук, В.А.Тарасевіч, П.Я.Тарасенка, У.І.Трафіменкаў, Г.І.Трубская, Н.М.Тужыкава, Г.В.Тумашкова, Ц.І.Тупіца, П.Дз.Урублеўскі, В.П.Ускоў, В.А.Усціменка, А.П.Ушкалава, З.І.Філімоненка, Г.М.Філіпава, І.Г.Фясенка, Л.В.Хіжынская, М.Л.Ходар, К.Ф.Целюкова, Л.М.Цітко, М.М.Цітова, М.П.Ціцяк, А.П.Цыхун, Ю.А.Цярэня, В.М.Чабатаронак, Б.У.Чабоцька, А.П.Чакліна, Е.С.Чарнова, А.Ф.Чарнякова, М.А.Чорная, Г.І.Шавель, І.Г.Шадур, С.А.Шалак, Н.П.Шалонік, Т.М.Шалюта, Р.І.Шамко, В.В.Шапялевіч, Я.В.Шарыпава, П.Р.Шастакоў, Л.В.Шахлевіч, Г.І.Швабоўская, П.Ф.Шкаленка, К.Я. Шкуднова, Н.І.Шматкова, В.П. Шульга, М.М.Шумаў, М.С.Шумская, В.В.Шчасная, М.П.Шыпінская, Н.А. Шыфрына, З.К.Шышова, В.П.Эгліт, А.У.Юдашкіна, М.П.Юдзеніч, З.Ц. Юдзянкоў, Я.І.Юралайц, З.А.Язерская, Н.Ф.Якаўлева, Ц.С.Яльчык, Е.І.Янушкевіч, Н.А.Ярэміна, Я.Р.Ярэц, В.А.Яўнайс, М.І.Яфімава, Р.С.Яфрэмава, Ю.М.Яшчак. **1968**. І.І.Абрамовіч, Е.Ф.Авярковіч, Т.С.Агеенка, А.С.Агінская, П.Д.Адзінцоў, К.С.Акачонак, Т.М.Аляксеенка, Н.Е.Амбразевіч, Ц.Ц. Андрэеў, К.М.Андраюк, Л.Г.Андрухіна, Ж.І.Андрушкевіч, А.Ф.Антончык, Н.В. Апацкая, І.Л.Архіпенка, З.Я.Арцем'ева, Я.П.Арэтаў, П.А.Астапенка, Н.Д.Асюлева, В.І.Аўрукевіч, К.С. Аўчыннікаў, З.М.Афонская, С.Р.Бажко, М.Н.Бакатанава, Н.М.Балвановіч, Н.А.Баравая, Н.В.Баранава, І.М.Барановіч, К.І.Бараноўская, М.С.Бароўскі, А.І.Барысевіч, А.І.Барэйка, Дз.Х.Батрова, В.Я.Баханькоў, Е.А.Бахарава, Г.В.Бежалёва, Р.Р.Бейненсон, Л.П.Бекерава, Н.М.Белайчук, В.А.Белакурская, В.В.Белая, С.М.Белы, У.І.Белы, М.П.Бельскі, А.П.Берасцнёў, М.Я.Бернштэйн, І.В. Бешанцаў, М.С.Блінкова, З.А.Бондар, І.Р.Бочкін, З.І.Бранавец, Я.С.Бранавіцкая, Ф.У.Бубен, І.А.Будай, Г.Дз.Буднікава, А.Г.Бузава, Н.І.Бузо, П.Я.Букініч, М.М.Буланкова, З.І.Булыга, І.П.Булыка, С.П.Бурак, С.В.Бусел, Г.Ю.Бухаўцова, Я.І.Бухцеева, Г.Я.Буцэнка, М.Ю.Буцявіцкі, Я.І.Бычкоўская, В.І.Бялугіна, А.Р.Бяспалава, С.Ф.Валатовіч, Т.М.Валадзько, В.А.Валожына, П.І.Валуй, Т.А.Валынец, А.П.Ванаршэнка, П.К. Варывончык, Ф.Ф.Васілевіч, М.М.Васілеўская, Б.Г.Васільеў, В.Э.Васілько, У.Я.Васілюк, А.П.Васькоўская, А.М. Ваўчкова, В.С.Вераб'ёў, А.Дз.Весялова, В.М.Віннікава, Я.П.Вішнеўскі, І.І.Волкаў, З.В.Вярбіцкая, М.М.Гавядзінаў, А.І.Галавешкін, А.С.Галакціёнава, П.Д. Галенчык, С.П.Гарабчанка, К.А. Гарбацэвіч, Л.В.Гарлачова, М.У.Гасцёва, В.А.Гатоўка, Н.П.Гаўрусейка, Е.П. Гаўрылава, Н.П.Герашчанка, А.І.Гертман, Н.Г.Гетманская, В.В.Гіліцкая, Д.Г.Гінзбург, І.Л.Гінсбург, Е.В.Гладкевіч, І.І.Глушцоў, В.Г.Гоева, З.Л.Голубева, М.Дз.Гразнова, Г.І.Грыгор'ева, А.А.Грынчык, В.М.Грынчык, І.А.Грыцук, П.Н.Гурко, Т.Ц.Гурская, Д.І.Гурчанка, Н.В.Гурына, Л.С.Гурэвіч, І.С.Гуцеў, Н.А.Дабравольская, А.А.Давыдаў, І.П.Данілевіч, В.З.Данільчык, У.М.Дарафей, В.А.Дарошка, А.М.Дашкоўская, В.М.Дзенісюк, Г.К.Дзенчык, З.А.Дзіяціна, Т.І.Дзядзюль, Н.П.Дзяжурка, М.І.Дзякевіч, С.Ц.Дзямешка, Н.І.Драбышэўская, Г.В.Драніцкая, К.Я.Другамілава, Ф.С.Дубінчык, П.М.Дубовік, А.Ц.Дубоўская, П.А.Дуброўскі, Дз.В.Дудараў, Н.І.Дудко, В.А.Дунец, Я.П.Дусь, М.А.Елісееў, П.С.Ерамейчык, Ц.А.Ерафеенка, В.У.Жабуртовіч, А.С.Жук, М.А.Жук, А.П.Жукава, Л.А.Жукоўская, М.М.Жукоўскі, З.С.Жураўлёва, А.П.Забенька, І.В.Завадскі, А.І.Задора, П.М.Зайкін, Е.І.Зайкоўская, Л.Н.Зайчык, Г.С.Зароўская, У.І.Зарэцкі, А.Л.Захарэнка, Т.І.Заяц, У.А.Зінавенка, К.С.Злобіна, А.Т.Зялёны, В.М.Зянькавіч, Г.А.Іванова, З.К.Іванова, П.М.Іванцоў, В.К.Івашкевіч, І.М.Івашкоў, Г.І.Ігнацьева, Л.Э.Іофе, В.І.Іцянкоў, Л.А.Ішчанка, А.І.Кавалёва, Е.А.Кавальчук, Т.К.Кадрэвіч, Л.Р.Кажамякіна, А.В.Казлова, Ф.А.Казлоўскі, Л.Я.Калініна, Н.І.Каліноўская, С.К.Кальчук, А.К.Калясень, М.Дз.Камарылава, А.П. Кандратовіч, М.М.Кандраценка, М.Ф. Кандрацкі, Н.А.Кандрусь, У.І.Канецкі, Т.А.Канцавая, П.А.Капусцін, М.М.Капусціна, М.К.Каралёва, А.П.Каралькоў, А.Н.Караткова, С.С.Карачун, Я.Ц.Кардаш, В.А.Кармілліна, Г.В.Кароль, М.М.Карпенка, М.Е.Карпучок, П.С.Карэтнікаў, В.Ф.Кастко, М.А.Касцюкевіч, І.П.Касцючэнка, М.І.Касяк, Н.В.Кацора, М.Т.Кіеня, М.А.Кілачыцкі, Е.М.Кіпнюк, А.А.Кісялёў, С.І.Кісялёў, А.С.Козік, Г.І.Конах, М.М.Кончыц, Н.Я.Корсікава, Ш.М.Коўнер, М.А.Кравец, Т.І.Крапошына, Л.В.Краўцова, П.В.Краўчанка, І.Г.Краўчанка, Г.Г.Круганава, А.І.Кругленя, А.Дз.Крукоўскі, У.Дз.Крукоўскі, Л.Л.Крупская, Я.С. Крывабловіцкая, Т.Т.Крывалапава, В.М. Крышко, Л.К. Кудраўцава, П.І.Кузьмічык, А.Е.Кузняцова, Ф.І.Куксін, К.Ф.Кулакова, Л.Н.Кулакоўская, А.А. Кулікава, Т.М.Кулінковіч, Г.М.Кунцэвіч, К.Р.Купершток, Я.В.Купрыянава, М.Т.Купрыянец, В.П.Курацева, Н.І.Курачыцкая, А.П.Курносаў, А.М.Курчэўская, К.Ф.Кухарава, Ф.Дз.Кухарава, М.В.Кухараў, Г.П.Кушалеўскі, Р.В.Лагачова, М.А.Ладуцька, І.П.Лазук, І.І.Лакішык, А.Р.Лапанькоў, Н.Ф.Лапіцкая, П.Р.Лапіцкі, Р.І.Лапіцкі, А.М.Лапунова, З.Ф.Латышова, Ф.В.Лаўчынскі, М.В.Лебедзева, Н.С.Лебедзева, І.Ц.Леўкін, М.П.Літвінаў, В.К.Лобан, В.Ц.Лонь, В.П.Лукашовіч, Г.І.Лылава, К.Е.Лысенка, Н.П.Лысуха, Я.С.Лябецкая, Р.С.Ляндацкі, І.А.Ляўда, І.Ф.Ляўковіч, А.І.Ляхаў, Л.А.Мазгавая, Т.І.Макейчык,

Я.І.Макутонін, Е.П.Малаковіч, М.А. Малашук, М.Ф.Маліноўская, А.М.Малышка, А.Л.Мальцаў, У.С.Марозаў, П.А.Мартыненка, І.М.Мартыновіч, П.А.Марціната, М.І.Масальская, М.Г. Мастовіч, У.Ф.Матрунчык, К.І.Мачаліна, І.А.Мацкевіч, Т.П.Мацкевіч, А.В. Мілова, А.А.Мінчук, Л.Ф.Мірановіч, Т.В.Мірошенка, Н.В.Місюк, Л.А.Міхановіч, І.І.Муравіцкі, А.А.Мусцейкіс, А.Б.Муха, Г.Р.Навумава, Н.В.Навумава, А.А.Налягач, В.І.Напрэенка, В.К.Насілоўская, М.С.Нацэвіч, П.П.Несцераў, З.А.Нікольская, С.К.Нікуленка, А.Ф.Новік, К.І.Новікава, В.А.Падзвінская, Г.І.Палонская, В.І.Папова, К.Дз.Папова, Л.К.Папова, М.М.Папоў, Я.С.Парфененка, Г.Ц.Парфёнава, В.Я. Паўлава, Л.М.Паўлоўская, Л.М.Пафнуцьева, П.К.Пацей, Н.С.Пацкевіч, Т.П.Пачынская, К.А.Пекар, Н.А.Петрачэнка, В.П.Піваварава, С.В.Піскун, Ф.А.Пішчыкава, Б.С.Пладуноў, М.М. Плескачоўская, К.Т.Прахарэвіч, Л.І.Прышчэпчык, Л.Ф.Пуранкоў, Э.М. Пяткевіч, А.Д.Пятрова, К.М.Пятровіч, Ю.Ф.Пятроўская, М.М.Пятрухін, Е.І.Рабцава, К.Л.Равянок, А.Н.Радзечка, М.Р.Радзянкова, Л.А.Радзішэўскі, А.А.Радоўская, Г.М.Радзько, Г.М.Разанка, Л.І.Разнюк, Д.Л.Ракашова, Ф.К.Расінскі, З.І.Родзін, Н.М.Роскач, Р.І.Румянцаў, В.С.Русакова, У.Т.Рыжыкаў, М.І.Рыльскі, Б.А.Рымашэўскі, В.В.Рытчык, Н.В.Саевіч, Р.П.Сакалова, В.А.Саковіч, С.В.Салагуб, Л.В.Самовіч, Г.М.Саўкіна, Н.Ф.Сачкова, Г.М.Селеванчук, М.Р.Семашкевіч, Г.І.Семянцова, В.П.Сергіеня, С.К.Сердзюкоў, К.А.Сідзюк, А.Р.Сімчанка, П.М.Сінічкін, П.П.Сірош, Н.М.Скалабова, В.В.Скалубовіч, М.А.Скуратовіч, К.І. Слабуха, К.Н.Смірнова, В.Ф.Сопатава, І.А.Сотнікаў, П.М.Сотчанка, Я.А.Сошнікава, В.А.Сошына, М.Дз.Станевіч, М.І.Старчанка, У.А.Стаскевіч, С.Г. Статкевіч, Т.Л.Стахоўская, А.А.Сташэўскі, У.С.Субоцін, М.М.Сулкоўскі, Н.Я.Сумарокава, А.К.Сураўцова, І.А. Сухарукаў, В.М.Сушкевіч, У.М.Сцяпанаў, І.І.Сысой, П.М.Сяргеенка, Ф.І. Сяргееў, М.І.Сятун, Н.В.Талмазава, М.Я.Талмачоў, Р.І.Талюш, Е.А.Тамаева, Л.І.Тамковіч, Е.З.Тараноўская, С.І.Тарасевіч, Г.Б.Ткачэнка, А.П.Тоўсцік, С.Р.Троцкі, А.М.Трошына, М.І.Трусаў, С.І.Трызна, М.П.Тузаў, І.Г.Тунякоў, П.П.Турайкевіч, Ф.А.Турскі, Л.Ф.Украінская, М.І.Унучак, Дз.П.Усаў, Н.І.Усікава, З.І.Усовіч, В.С.Фаміна, К.М.Фаміна, В.У.Фомчанка, Ф.П.Фрайман, Г.А.Фядосава, Е.С.Хадарэнка, Р.І.Хамчонак, Н.Я.Хамякова, С.М.Ханенка, В.А.Хапалюк, А.Л.Хашкоўская, З.У. Хвір, Н.П.Хмурчык, Л.С.Храмцова, А.І.Цалко, Н.Дз.Царова, П.П.Ціванюк, Ш.В.Цівес, С.І.Цімошчанка, В.А.Цітова, Г.А.Цітова, В.К.Ціхаміра, С.І. Цішкавец, І.І.Цяртычная, М.П.Цярэшка, М.М.Цярэшчанка, Я.А.Чабан, В.К. Чайкоўская, Б.Р.Чамаданаў, М.Б.Чаркас, М.І.Чарняўскі, М.К.Чмярэнка, А.Т.Чубкоў, Р.Е.Чэрні, А.М.Чэрнік, В.С.Шабалтас, М.Я.Шабан, С.Л.Шакулава, Е.Г.Шалак, В.Дз.Шалуха, М.Ц.Шалышка, Я.К.Шалькевіч, М.П. Шалюта, Г.С.Шанько, Т.В.Шапавалава, І.З.Шапіра, А.С.Шарыбчанка, А.П.Шарэц, М.Л.Шатанава, Р.Ф.Шаўчук, С.С.Шаўчук, Л.Н.Шафранаў, Ф.Е.Шашэнька, І.М.Шведаў, Л.Ф.Шкляр, В.А.Школьнікаў, М.Р. Шкрабава, А.К.Шкутаў, В.М.Шлец, Н.А.Шляхценка, З.А.Шмуратка, В.І.Шніп, А.Ф.Шурупова, І.Г.Шут, У.М.Шутко, М.С. Шчарбачэня, А.А.Шчарбіна, У.Л.Шыла, Н.Р.Шылкіна, А.В.Шынгель, В.Г.Шынгель, П.А.Шынкароў, Н.Р.Шырай, А.В. Шэдаў, М.І.Шэйпак, С.Р.Шэміс, Г.І.Юркевіч, М.Н.Юркевіч, А.С.Юркоў, В.І.Якубовіч, М.І.Якуніна, М.І.Якушэнка, Я.Ц.Яраслаўцаў, М.Р.Ярашэвіч, А.В.Ярмоленка, І.І.Ярмусік, Б.К.Яроцкі, А.П.Яўланава. **1970**. П.М.Абраменка, Н.А.Агнішчанка, В.М.Аксёнава, Н.М.Акунёва, В.А.Алісіевіч, М.С.Аляксеенкава, В.В.Анішчук, А.П.Анцімонік, С.Дз.Арлова, К.М.Бабіцкая, М.А.Багдановіч, В.І.Баран, А.В.Бараноўскі, Т.Я.Баталка, Г.М.Баўшава, Т.В.Белянкова, В.А.Бембель, М.Дз.Брашко, М.М.Буеўская, М.М.Бусел, А.К.Бяглюк, І.М.Валошын, Г.І.Вараненка, Н.А.Васілеўская, Г.Ф.Вянцковіч, М.І. Гараднічы, Б.І.Гемская, Н.П.Голікава, Г.М.Грыбоўская, Я.К.Дзяменцьеў, З.У. Дзямідзенка, Г.Н.Дрожжа, А.Р.Друшчыц, А.П.Дубініна, І.Я.Дуброўская, А.С.Жук, В.Р.Жукавец, І.І.Жураўскі, Т.І.Заяц, В.І.Іцянкова, Н.П.Кавака, Р.І.Кавалёва, І.К.Кавалёў, В.П.Кавальковў, Т.П.Кажамякіна, М.М.Калеснікаў, Т.М.Калядка, З.І.Канавалава, Е.Т.Каралёва, Л.У.Каржыцкая, М.В.Каўцэвіч, Л.Г.Кірпічэнка, У.К.Кісялёва, М.В.Козел, Г.П.Корзун, М.П.Косцеў, Ф.Ф.Кудасаў, Дз.А.Кудрыс, Н.А.Кулакова, А.Дз.Кунцэвіч, В.А.Купрэйчык, М.П. Кучкоў, Г.С.Лабовіч, М.А.Лазарава, М.Ц.Лейфман, Н.М.Лістратава, Л.Я.Лукашок, Н.А.Лукічова, С.З.Ляйховіч, М.Ц.Ляўкова, Е.І.Ляшчанка, Д.М. Маёрава, Р.М.Макарэвіч, У.С.Малчанаў, А.Ф.Марозава, Я.І.Марцінюк, Г.А.Мілашэўскі, П.М.Міхалап, Я.І.Муралава, П.А.Мускі, В.І.Назарэвіч, Я.П.Нікіцін, І.А.Новік, Г.М.Новікава, Л.К.Новікава, Т.Р.Паборцава, І.Ф.Пабудзінская, Д.А.Пацеенка, Л.Дз.Петракова, С.Ц.Пігулеўскі, Г.Ф.Праходская, М.А.Пухава, Н.К.Рабёнкава, К.Дз.Рабчынская, Э.А.Рыдзеўскі, Ю.Ш.Рыўкіна, В.А.Савіцкая, Я.І.Санько, В.Е. Саўчанка, М.М.Саўчанчык, А.М.Сачок, А.Ф.Свістунова, Н.К.Сідаровіч, А.Р.Сідракова, А.А.Сімчанка, А.І.Сінкевіч, Э.Л.Сінкевіч, Н.І.Сляпчук, А.А.Собаль, М.І.Сушко, М.М.Сцепаненка, М.А.Сэй, В.А.Талокіна, А.І.Таранда, Б.І.Таўбін, Н.С.Трафіменкава, А.Ц. Трацякова, Я.А.Урублеўскі, Т.М.Фадзеева, Н.Я.Філазафовіч, Т.П.Філіпенка, А.П.Церахаў, Н.П.Ціханюк, Л.Я.Цярэнцьеў, Г.М.Чэпікава, М.Дз.Шалай, Л.В.Шалуха, К.Ф.Шандрык, Л.М.Шарава, Л.А.Шнурко, П.П.Шпакоўская, В.П.Шупенькава, Н.І.Шыганава, М.А. Язвінская, Я.І.Якубоўскі, Л.М.Якушава. **1971**. С.А.Абразцова, М.В.Абросімаў, К.І.Агурцова, А.І.Акуленка, В.М.Амялюсік, А.Ц.Армонік, М.А.Асмалоўскі, Г.І.Бабіч, М.Ц.Бабуркін, Э.І.Багдановіч, Л.А.Бакава, Ф.Ф.Бандаровіч, В.М.Бандарэнка, Г.Ю.Бароўка, М.Л.Басацкі, Н.І.Безбародзька, М.А.Берасцевіч, У.М. Бусел, В.М.Буяк, Г.У.Варабей, А.І.Варонін, Г.М.Васіленка, Р.І.Васілеўская, Н.Р.Вашацькова, В.І.Вільчынскі, Дз.К. Воранава, А.І.Вялічка, А.І.Вярбіцкая, В.М.Гарэленка, Н.І.Герасімава, Л.М. Гінзбург, Г.Я.Гольцман, В.С.Грамданкіна, М.С.Давыдава, Т.П.Дзіканава, А.С.Дзялендзік, М.П.Дзятлава, Р.А. Дражнюк, Н.І.Ерамёнак, С.Р.Ерашова, В.С.Еўдакіменка, А.І.Жаваранкава, А.Р. Жукава, Н.М.Збітнева, І.Ц.Зяневіч, К.П.Зяньковіч, М.С.Іеўлева, І.Л.Кавалёнка, Г.Р.Кадырка, А.П.Казловіч, І.Дз.Калінін, К.Т.Камароў, Л.В.Камінская, М.Б.Карабан, І.У.Карабанава, А.Ц.Карпіловіч, С.І.Каршук, Л.Р.Катлярова, Г.Е.Кіршчына, В.І.Кірылава, І.В.Клікунец, К.К.Клімаў, З.Я.Кожар, В.В.Косцева, М.Ф.Красніцкая, Н.У. Красько, Н.А.Куляшова, Л.К.Купчэня, Г.І.Куцяпалава, З.Л.Лабкова, М.Дз.Лазарэвіч, Л.В.Ліпай, К.П.Лусікава, Л.П.Майсеня, Н.П.Малашка, В.А.Мамыкіна, С.У.Марозаў, В.П.Марудава, К.С.Маханькова, З.Я.Мельнікава, В.П. Млынарчык, З.П.Наронская, Н.І.Нахаева, В.М.Нікіценка, В.К.Нікіцін, П.У. Новік, Я.Дз.Панасенка, В.М.Панкевіч, В.Г.Пляскач, М.А.Побаль, Г.М.Прохарава, Е.Ц.Рабочая, Н.П.Рагацэвіч, М.І.Рамушэвіч, І.В.Раўнейка, Ч.К.Рацько, В.Д.Рубанава, У.А.Рыбчык, А.Н.Савінава, В.В.Савіч, А.П.Салдаткіна, А.І.Сіліна, А.М.Сіткевіч, М.Н.Смалюк, Л.І.Стока, Н.П.Стралкоўская, П.В.Студзянкоў, М.А.Сурта, М.К.Сцегін, С.С.Сянюк, Г.Р.Сяргеенка, Р.І.Сярноў, М.С.Талмачоў, Л.Б.Топаль, І.Ф.Тоўкач, С.А.Умрэйка, К.М.Філатава, Н.І.Фядосава, М.М.Ханцэвіч, З.І.Хілько, Н.А.Цілюпа, М.П.Цыганоў, Г.П.Цыялкава, А.В.Чапко, М.І.Чарнякевіч, А.І.Чарткова, Г.К.Шарапаў, С.І.Шлапакова, В.А. Шульга, Г.Р.Шынкарова, Г.І.Яблонская, А.П.Яроменка, Ю.С.Яроцкая, Г.С.Яўстратчык. **1972**. М.І.Антошчанка, Э.А.Аржанік, Н.П.Арыніч, Г.І.Аўчыннікава, А.В.Ахраменка, Н.В.Бабіна, А.Р. Бабова, М.К.Бакаць, Г.Ф.Баркоўская, Я.І.Бердашкевіч, А.П.Берднікава, Л.Л.Блешанкова, Г.М.Бондар, П.Р.Бондарава, В.Д.Брундукоў, К.П.Булыга, Л.І. Вялічка, М.І.Гавейна, Г.В.Ганчарова, Л.Б.Ганчарова, М.Ю.Гарашчук, Н.В. Гваздзюкевіч, К.І.Грузімава, В.А.Гурын, З.С.Дарафеева, К.Л.Дзешкавец, В.Д. Дрозд, Г.А.Явоста, Г.Я.Ерамейчык, А.Д. Жалковіч, Р.Т.Жанеўская, Н.Н.Жарнакова, І.І.Забабуха, Т.М.Забароўская, А.Ф.Занько, В.Дз.Іваноў, Л.І.Каваленка, У.В.Казлоў, Л.А.Кайровіч, А.А.Кандрацюк, Г.І.Канцавая, В.К.Карпікава, Н.Х.Касаткіна, М.А.Кірпічэнка, М.І. Кір'янаў, З.А.Клемзікава, М.У.Клігуно-

ва, М.П.Кляцкова, М.А.Кот, Е.А.Котава, Н.К.Кравец, В.Е.Краснік, Л.І.Кузняцова, Н.В.Кулагіна, Ч.І.Кучынская, С.П.Лагун, Р.Ф.Лазовік, Т.Э.Лапаціна, Г.А.Леанідава, М.І.Левы, А.І.Ляончыкава, К.Ф.Майсевіч, Р.А.Манкевіч, Т.Р.Марозава, Н.Н.Матора, Н.А.Мохава, М.А.Мятліцкі, В.Л.Навіцкі, М.І.Няронская, П.С.Падалка, М.М.Палякоў, Я.В.Панкоў, П.П.Парункевіч, Н.А. Паўлава, А.У.Паўловіч, Т.І.Паўловіч, М.С.Паўлючэнка, П.П.Пашкевіч, З.А.Прохар, М.У.Прэткель, А.Р.Пушкарэвіч, Н.І.Рагаўцова, Н.П.Раентава, Ф.М.Раманчанка, А.А.Ратквіч, З.А. Рупрэхт, Я.У.Сакалінская, Н.Дз. Свадкоўская, А.С.Скабей, Я.Ц.Смірнова, Г.І.Станютка, М.М.Стрынкевіч, П.І. Трафімовіч, Л.М.Хаткевіч, А.П.Царэнка, Р.Р.Цодзікава, Ю.П.Цярохіна, В.В.Чачко, В.Х.Чыкіда, В.І.Шаблюк, Е.І.Шавель, Л.К.Шапялевіч, К.Я.Шпадарук, У.У.Юрчык, Дз.П.Якаўчык, У.К.Якімовіч, Н.П.Ярмак, М.М.Яскевіч, М.С.Яўневіч, Г.Ц.Яцына, Т.М. Яшына. **1973**. Л.М.Антонава, П.З.Антонаў, В.С.Аўраменка, Л.С.Багдановіч, А.Л.Байчык, П.М.Бобрык, Г.П.Брушутнава, В.П.Вашкевіч, В.С.Галуза, Н.Я. Грачанкова, А.А.Гонтарава, Я.А.Гурыновіч, К.М.Данілава, Р.С.Дзенбург, В.М.Дзям'янкава, Г.І.Дзівак, Г.І.Дунец, В.П.Жук, Р.Ф.Жук, Я.А.Зінкевіч, В.Я.Зубар, У.І.Іваноў, У.А.Іваньковіч, Н.І.Кавалец, І.В.Капуста, З.М.Карасёва, А.В.Карпава, Б.А.Карпаў, І.А. Касуха, В.Н.Катасонава, П.І.Катлярчук, К.І.Каўбаска, В.І.Клімовіч, Т.І.Крачэўская, М.М.Круглей, І.С.Кулага, Т.К. Лазарэвіч, В.М.Лакатко, З.В.Ліцвіненка, Л.В.Лясовіч, Р.І.Макшова, М.М.Манак, Н.Т.Маторная, С.К.Мікульская, М.Г.Мінкевіч, Н.Т.Міцкевіч, В.А.Навіцкі, Г.П.Нагорная, Г.К.Нацэўскі, Л.А.Недарэзава, Р.С.Паляшчук, К.Я. Панамарова, Г.І.Паспелава, В.М. Пішчалава, Р.М.Прохарава, Т.Ц.Пясоцкая, А.Я.Радзішэўская, М.І.Раманава, В.Д.Рывоненка, З.Н.Рыдлеўская, Г.С. Рэянтовіч, М.С.Семяняка, М.А.Сідарэнка, Л.А.Сініцкая, К.С.Слесарчук, Л.В.Старавойтава, В.Р.Старасотнікава, Л.І.Старчанка, І.С.Сукрысцік, Г.Д.Сыроватка, А.І.Фаміна, Г.П.Фрол, Л.А.Цішкевіч, Я.А.Чаховіч, Л.Т.Шарко, З.Р.Шкурынская, С.І.Штурыч, К.В. Шчацінкіна, Т.Л.Шыпількевіч, А.В. Язвінская, М.Я.Яўсеенка. **1974**. Н.І.Андрушкіна, М.М.Антановіч, Н.І.Бабровіч, А.А.Бандарэнка, В.З.Басарыгіна, Ф.Г.Бядунька, Г.Е.Бурак, В.К.Валадзько, А.Ю.Валошына, М.П.Васілеўскі, В.М.Верамяюк, А.В.Верас, А.А.Вінакураў, Д.Б.Ганусевіч, В.Г.Гаховіч, М.П. Герасіменка, П.Б.Голад, М.Г.Голікава, В.В.Голубева, С.М.Грэнкаў, Н.Ф.Дзёміна, Я.Я.Дзмітрук, М.І.Драгун, У.А.Дударэнка, У.А.Жукоўскі, Р.Ф.Закржэўская, М.Н.Зубчынская, С.П.Зяцікаў, В.А.Іванова, К.Ф.Іванова, П.М.Іовік, В.М.Казак, У.С.Казлова, А.Ф.Казлоўская, Л.К.Кандратава, А.П.Комлеў, І.П.Кашына, Н.П.Краміч, І.Р.Краўцоў, В.П.Кукішаў, В.Ф.Кульбіцкі, К.А.Лісоўская, В.С.Лось, Н.А.Лур'е, Н.Ц.Лычова, В.Ф.Мазурын, Н.Б.Мажайская, Л.Ф.Маркевіч, Я.І.Масквічоў, Ч.П.Махнач, М.А.Мікульскі, Л.М.Міцкевіч, І.Я.Мішэнін, М.Ф.Мяснікоў, Г.А.Мяцеліца, Н.Ф.Новік, А.Ф.Новікава, В.І.Палубан, М.І.Паўлаў, Н.П.Пуцькова, П.І.Пшанічная, М.С.Радзюкоў, Т.П.Раманоўская, Г.А.Раманчык, Г.І.Рымараў, І.В.Семянчук, Н.А.Сесіцкі, У.В.Скараходаў, Э.І.Смольская, Т.Б.Стасевіч, Л.К.Тарасевіч, Е.Р.Тараховіч, Я.І.Траснікова, Г.Я.Трухан, Н.В.Усевіч, Л.С.Харловіч, Л.М.Цвірко, Н.С.Цвяткова, В.У.Чаркасава, У.М.Чупрынскі, Т.І.Шабаліна, П.М.Шарэпа, Л.В.Шутава, У.Шырко, І.С.Ярмолінскі. **1975**. Л.С.Абазоўскі, В.З.Алейнікава, В.І. Александроўская, П.М.Анічэнка, В.Р. Арлоў, Н.І.Арлоўская, Р.І.Арцімовіч, Н.Я.Асмалоўская, У.М.Асамлоўскі, А.С. Астапенка, Я.В.Аўсянская, Н.Я. Балмакова, В.С.Банадзькева, Т.Н.Бандарчык, В.А.Баркоўская, В.А.Баркоўскі, А.Дз. Белагорцаў, М.А.Бетанава, М.Ф.Бобаў, П.А.Бобрык, Ч.П.Бондар, А.А.Бранкоўская, А.А.Булаўка, А.Д.Булашаў, І.У.Буры, І.І.Варабей, Ф.С.Варабей, Л.І.Васько, Т.П.Відура, Л.К.Вярбіцкая, Т.Ц.Ганчарова, І.К.Гінтаўт, Г.П.Грозберг, Т.Я.Гурэвіч, Я.М.Гучак, В.А.Дабаровіч, І.Д.Дворкін, Л.М.Ермачонак, Т.Л.Еўдакімава, А.К.Еўсявіцкая, Г.Л. Жызнеўская, Г.Я.Жызнеўская, А.П.Жукава, В.С.Заброцкая, Л.А.Зарэцкая, А.А.Здраеўскі, Р.І.Зянькоў, В.І.Кабяк, Н.С.Кавалкіна, У.С.Казлоў, Я.М.Кананчук, І.В.Каравацкі, А.І.Карпава, Л.А.Карпінская, А.Р.Касцюкевіч, В.М. Касцян, В.Ф.Кашпар, А.Л.Кебец, І.І. Кожар, М.П.Корж, В.К.Котаў, М.П. Красікава, Г.С.Краўчанка, Н.І.Крэнь, Г.С.Кузёмкіна, В.Г.Кудрашоў, А.М.Кулік, Я.Л.Курган, М.П.Кургінскі, Н.І. Кутынка, Я.А.Лазавік, В.І.Лазарава, М.І.Лазарэнка, М.І.Макарчук, М.І.Макеенак, В.Н.Маркевіч, Л.М.Марозава, М.С.Мароснікава, М.А.Марціновіч, Я.А.Марцулевіч, В.П.Маскаленка, Л.А. Маўчанюк, Л.М.Махнач, М.М.Мачанава, В.С.Міхайлаў, Г.А.Мураўёва, С.М. Муркоў, Г.І.Назарчук, Л.М.Палевікова, Я.В.Палонская, Г.Н.Панасенка, Н.Ф. Панасюк, З.А.Парыгіна, Л.Ф.Пашынскі, М.А.Прылуцкая, С.К.Радзевіч, Г.Я. Радзько, І.В.Радчанка, У.І.Радчанка, Я.Ф.Расудоўская, К.І.Савіцкі, С.С.Сазонік, Л.Ф.Салавей, Т.І.Самцова, І.Ф.Селязнёва, Р.М.Серыкава, Г.П.Сідорка, А.С.Сілівёрстава, В.І.Сіневіч, Н.І.Сіцкевіч, І.А.Скаруцкая, С.Б.Смолкін, М.К.Сувалаў, В.П.Сураўнёва, Л.Д.Сцефановіч, Р.І.Сянько, Я.С.Таборка, М.Г.Трафімовіч, А.І.Траццякова, І.В.Філіпава, І.І.Фрадкін, Л.Ц.Фралянкова, Г.В.З.Хітрык, М.І.Царык, Ю.І.Цвірко, В.М.Цыуля, А.С.Чаранко, І.В.Чарніцкі, А.П.Чаша, А.М.Чурыла, А.І.Шалак, Г.Дз.Шаніна, Л.А.Шатраўка, М.С.Шаўкун, Дз.В.Шульгоўская, М.І.Шумская, Н.С.Шуплякова, У.Ф. Шутаў, В.С.Шышоў. **1976**. Л.У.Андрэева, М.П.Аронаў, В.М.Бабакова, Я.М. Баркова, А.Б.Будніцкая, М.В.Ваніна, Т.С.Вараб'ёва, Ф.А.Варашніна, Н.М.Васілеўская, Г.У.Васільева, В.Ф.Васюшка, А.Е.Герашчанка, Я.П.Грыб, Я.Я.Грыгуць, П.Е.Гукаў, А.П.Дамарацкая, М.І.Дварэцкая, Н.Н.Еўпак, В.І.Жалезная, Т.С.Жук, К.Н.Загуста, М.П.Зайчук, Н.І.Засценская, А.І.Заяц, М.А.Казбярук, І.Ц.Казырыцкі, В.У.Каладзінская, Г.Н.Кандрацьева, Л.А.Капылова, Л.С.Караленка, С.Ф.Каранеўская, А.С. Каржукова, М.А.Кібісава, М.І.Козел, П.І.Краўцэвіч, Л.К.Крыцкая, Т.Р.Лабур, Г.Р.Лось, А.Т.Лукашэвіч, У.І.Ляпёшкін, А.А.Ляхота, В.І.Манаскіна, Р.А.Марачава, М.С.Марціновіч, Л.П.Мінчукова, Э.С.Міранавіч, З.Р.Мяшкова, С.С.Найдзен, Л.П.Нікановіч, В.І.Піляўская, Н.Т.Прыбыткіна, В.К.Рабцэвіч, М.Ф. Рыжанкова, В.І.Савенка, М.М.Сарынава, К.І.Серада, Г.І.Сідаровіч, П.І.Сікора, І.П.Сіманоўскі, Б.І.Смародзін, А.Р.Спарбер, Э.П.Стаховіч, А.М.Талабаева, І.І.Трус, В.А.Феакцістаў, Г.М. Фількова, Т.М.Цёмная, Т.І.Чобатава, В.Дз.Шасцерыкова, Л.І.Якімовіч. **1977**. В.І.Акулава, К.А.Антонава, Т.В.Аўсеенка, Ю.А.Бабіч, Н.В.Багамолава, Н.І.Багацюк, М.І.Багачоў, Н.С.Багданава, Н.С.Балантэр, Т.К.Бандарэнка, П.Ц.Баравік, Н.Дз.Баравіцкая, Н.В.Беладзед, А.А.Брач, В.С.Былюк, К.Я.Бычкова, Н.І.Варанецкая, В.Т.Вірынскі, А.П.Герачынская, Ю.М.Гірдзь, Н.Р.Гняўко, П.П.Грабеннікаў, А.М.Грыцаў, А.І.Гурскі, А.П.Давыдаў, Г.П.Данешчык, Н.М.Данілава, Р.П.Дарошка, Л.К. Дзмітрыева, Л.М.Дзянісман, Э.К.Дубаневіч, Л.І.Жданоўіч, Т.Дз.Жыліна, С.Л.Жылко, М.І.Жырніс, Н.П.Жыткова, З.П.Зайцава, А.І.Зарэцкая, М.К. Здрок, В.М.Зуб, Л.Л.Іваноў, М.П.Ігнаценка, В.І.Ісаева, Р.П.Калеснік, Т.М.Карпенка, В.П.Кацянкоў, В.Р.Качурка, З.З.Кашырына, Т.М.Кісель, Н.Р.Кіяшка, А.А.Крэнь, А.М.Куранкова, І.Б.Лебедзева, Н.Р.Лівенцава, В.Г. Лісоўскі, А.А.Лобач, Н.Р.Малей, В.І.Марціновіч, Г.В.Марцякова, М.Я. Мікульчык, Б.А.Муляраў, В.Г.Мурашка, І.Б.Навумовіч, А.М.Несцярчук, І.І.Палій, В.Дз.Палікіна, Г.А.Палуянская, Ф.П.Панцялеева, Р.М.Панчанка, М.Г. Парашчанка, Г.А.Паўлоўская, У.Ф.Піляк, К.А.Пісарык, Дз.В.Прастаквашын, І.Л.Пятрова, Л.С.Радкевіч, Т.А.Разгуліна, В.І.Разумава, А.З.Раса, П.К.Родзічкін, М.А.Семянчук, К.І.Сімаковіч, І.М.Сіманенка, Р.А.Сташынская, В.А. Сташэўскі, А.А.Стральчонак, Л.Р. Сямёнава, К.М.Трафімук, Ф.А.Тумілоўіч, В.М.Турбан, У.В.Усціновіч, А.У. Хмяльніцкі, Л.П.Худалеева, А.Л.Хутарны, М.П.Цішчук, А.Я.Цярэнцьева, Л.В.Чыгір, Л.К.Шатухіна, П.М.Шэлест, В.Ц.Якаўлева, Я.Дз.Якімовіч, В.С.Якубовіч, Л.Я.Яшнова. **1978**. А.М.Азарка, Н.В.Амельянюк, М.У.Андрончык, Л.А. Анзель, В.М.Анціпкіна, В.Р.Аўраменка, Г.П.Аўтуховіч, А.К.Афанасенка, Л.У.Барабанава, В.І.Бараноўская, А.А.Барысевіч, А.С.Бельская, А.П.Бузаева, І.П.Бу-

ланава, Н.М.Бяляцкая, З.І.Варшаўская, Г.А.Васілеўская, Л.М.Вінцэўская, В.А. Воран, А.Р.Галавач, Р.Ф.Ганчар, А.Н.Гарканава, А.П.Гілевіч, Н.А.Гірсянок, А.А.Глазоўскі, В.М.Грыгор'ева, Дз.Р.Дошчык, Л.Ц.Дубко, А.К.Жахоўская, В.П.Іваненка, В.С.Іванова, В.С.Казлякова, А.І.Каменка, В.П.Кручанок, Г.П.Крывянкова, С.С.Крэчка, З.У.Лазоўская, І.М.Лашук, М.І.Лівенцаў, А.П.Лісаў, Г.І.Ліцвіновіч, К.Я.Лойка, Л.С.Луцэвіч, В.П.Максімовіч, Г.Л.Малаш, М.В.Маркусенка, М.Ф.Марозаў, Л.Я.Мільшына, І.І.Міхалка, А.В.Міхнікевіч, Я.А.Мураўская, М.Дз. Мядзведзева, І.А.Палуянчык, Г.М. Паўлава, М.В.Петрашкевіч, В.П. Пілюта, П.І.Радзькоў, У.І.Рубан, І.І.Русак, В.Р.Русанава, М.І.Рында, М.Д.Сагановіч, К.В.Сажына, І.Ф.Салавейка, С.М. Самолейнка, Н.Дз.Сачанка, Г.А.Серакова, Н.Дз.Сідарава, М.А.Скіпар, В.С. Сраброўская, К.М.Сталярова, М.М. Труханава, Т.Р.Трыгубская, Р.П.Туравец, В.М.Туркевіч, А.А.Цімошчанка, А.І.Цітоў, Ф.Ф.Цудзіла, З.Дз.Цябут, Л.І.Шаўчэнка, А.С.Ясяновіч. **1979**. М.Г.Агурцоў, Г.І.Аляксеенка, Ф.Р.Багдановіч, М.У.Вараб'ёва, Р.Ц.Васілевіч, Н.Р.Ваяводзіна, В.Я.Верамеева, Л.І.Вяткоўская, Л.І.Вялічка, К.І.Гаякоўская, Л.Б.Гінтаўт, Л.А.Грубенка, Н.В.Гурэева, Н.Ц.Забермаг, В.А.Здановіч, К.А.Ісай, М.А.Казакоўцава, У.Л.Кастрыцкі, Н.Н. Круглова, Я.А.Кудраўцава, М.І.Лацянкова, Л.М.Леўс, Г.К.Лісоўская, А.А.Лопан, А.А.Максімаў, В.П.Марозава, У.А.Мацюкевіч, Ж.П.Міронава, В.П. Мядзведзь, Л.Ф.Паваляева, Т.М.Патапава, Л.Н.Пісарэвіч, К.С.Пракаповіч, А.П.Пуцькоў, І.П.Пятрова, М.С.Пятрова, Н.М.Сандрозд, М.А.Санько, Н.М.Сідарэнка, Н.С.Слясарчык, Р.І. Старасвецкая, У.П.Стрэльнікаў, Г.Р.Табанюхава, Н.А.Хайноўская, І.І.Хацкевіч, В.П.Хургіна, Г.Р.Цітова, І.М.Шаламіцкі, Я.І.Шыбека, Н.А.Шэлехава, М.С.Юрэвіч, В.І.Якавенка. **1980**. Д.М.Абразцова, Б.А.Акалатовіч, В.П. Бадабед, В.А.Бакава, А.В.Башчук, В.І.Башылава, Г.М.Бугрова, А.Я.Васільчанкаў, І.В.Валадзько, В.І.Варажэйкіна, А.Дз.Вяль, Г.М.Гараніна, В.А.Гурыновіч, Я.Р.Духовіч, К.Ф.Заяц, А.Дз.Зобнінская, М.Ф.Змітровіч, В.В.Зуева, Дз.М.Калапетка, А.Р.Каменшчыкаў, Р.Дз.Каралёў, В.К.Кісель, М.І.Краўчанка, І.П.Лейка, С.І.Ліноўскі, Б.А.Літкін, М.Г.Лугаўцова, Л.І.Лузгіна, А.І.Макарэвіч, І.П.Макарэвіч, М.М.Маталыгаў, М.В.Некрашэвіч, В.В.Нікалаеў, В.П. Пакаташкін, С.І.Палей, В.Д.Панкевіч, С.К.Пятрушка, Л.Дз.Румянцава, У.І.Рэкуць, І.А.Саковіч, Г.Р.Саўчанка, А.С.Саўчык, Т.В.Сушкова, М.Л.Федзяцова, В.З.Холад, А.Я.Чудакоў, Т.М.Чырычэнка, В.І.Шапавалава, М.Н.Юркавец, Р.Э.Юркевіч, М.І.Якубовіч, П.І. Ярмола. **1981**. Б.Ф.Агароднікаў, Я.А. Аляхновіч, І.П.Антоненкаў, І.Л.Ведзянеева, А.П.Глухараў, Л.С.Жугер, В.А. Мацкевіч, Г.М.Попель, Г.Ф.Сцяжко, А.Я.Трафімук, К.А.Юша. **1982**. А.С.Асіпенка, Г.Р.Атаманчук, С.Г.Багдановіч, М.П.Баранава, П.М.Валасюк, Л.Н.Волкава, Ф.М.Ф.Вранко, Ж.М.Гарбунова, У.П.Гуд, Б.А.Гуляеў, Т.А.Давідовіч, П.Дз.Дзмітрыеў, М.Ц.Кавалёва, Н.Л. Касяк, Ф.Р.Кітуновіч, А.М.Клачко, Е.Я.Лабачова, М.Ф.Падсіткаў, Н.Г.Паўлава, Н.С.Пашкоўская, Т.А.Пісьмянкова, Я.С.Рымкевіч, Б.Б.Федаровіч, М.К. Філановіч, Г.І.Шумская, Л.С. Шчарбовіч. **1983**. М.М.Дворак, І.Л.Емяльянава, Л.Ц.Калядка, У.М. Кацнельсон, Я.М.Крылоў, С.І.Слізскі, Г.І.Тарасава. **1984**. А.П.Агаркава, А.І.Брэсцкая, Л.В. Высоцкая, Г.А.Каршакоўскі, Г.І.Русак, Н.Г.Салаўёва, У.А.Сіневіч, В.Дз. Яцухно. **1985**. Н.А.Анішчанка, Г.Ю.Бурынская, М.А.Быкоўскі, Ф.Р.Гераскевіч, М.Ф.Гукаў, В.Н.Кісялёў, В.І.Раманчук, Л.У.Рачкоўская, М.М.Рудэнка, А.Ф.Худалей. **1986**. Л.У.Кур'ян, Т.П.Парфёнава. **1987**. А.В.Букач, С.Е.Варакса, М.П.Жыгалава, Ф.Г.Забродскі, Н.П.Кароткая, М.Б.Касьянюк, Дж.А.Курчэўскі, А.В.Руцкая, Н.В.Сухоцкая. **1988**. Л.К.Сухнат. **1996**. В.А.Гербутаў, У.М. Здановіч, Ю.У.Маслаў, В.М.Прахарэнка, З.К.Чумакова. **1997**. Л.М.Дзмітрыева, Г.А.Зарэцкі, М.М.Серафімава, К.С.Фарына.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ПРАВІ́ЗАР БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР правізарам, што працавалі па спецыяльнасці не менш за 10 гадоў, асабліва вызначыліся сваёй практычнай дзейнасцю ў галіне аховы здароўя і актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 3.2.1978, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Скасавана 23.11.1988. У 1971—78 профільным спецыялістам аховы здароўя, у тл. правізарам, прысвойвалася званне заслужаны работнік аховы здароўя Беларускай ССР.

Заслужаныя правізары Беларускай ССР 1972. К.І.Фёдарава, Г.К.Ярмоленка. **1975**. З.А.Якутава. **1976**. П.Г.Дзічанкова. **1978**. В.І.Альшэўская, Н.П.Гайс, А.І. Шупо. **1979**. Г.Ю.Баранчук, І.Я.Жаркевіч, М.М.Кротава, Г.І.Лапыш, Г.М.Якушэнкава. **1980**. В.М.Кароль, Л.В.Раманчанка. **1981**. Т.Ф.Верас, С.М.Катырла, Т.М.Курносава, Ч.А.Лашук, Т.М.Чупілава, С.Р.Шамрук, Л.І.Шорахава, Ф.П.Яфрэменка. **1987**. Л.А.Лаўрова.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК АДУКА́ЦЫІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. навук.-пед. і інш. работнікам устаноў адукацыі, органаў кіравання сістэмы адукацыі, што працуюць па спецыяльнасці 15 і больш гадоў, за заслугі ў пед. і выхаваўчай рабоце, арг-цыі навуч.-вытв. працэсу, яго навукова-метадычным забеспячэнні. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 23.11.1988 існавала званне засл. работнік нар. адукацыі Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь

1988. Н.Г.Краснова. **1989**. Д.К.Алейнікава, М.А.Андылеўка, М.А.Аўласевіч, М.А.Буйко, У.А.Гарбацкі, Л.Р.Грамыка, М.М.Данільчык, М.І.Катлінскі, М.Р. Міхайлаў, Л.І.Мукасей, А.М.Русакова, І.М.Солдак, Н.А.Сторажава, М.С.Хандогін, У.А.Якавенка. **1990**. Я.П.Антаневіч, В.В.Асмалоўскі, Т.П.Байкачова, Л.І.Бурак, В.К.Васпукоў, М.Г.Голчанка, М.М.Дабралюбаў, Г.І.Дабрынеўская, А.М.Дзмітровіч, Г.М.Зданевіч, Я.Н. Карпянкоў, М.І.Кіш, В.М.Круталевіч, Т.М.Лазарэнка, І.К.Лапацін, П.М.Макарук, С.П.Мінкевіч, А.Ц.Пікулёў, Л.М. Пякарская, Т.І.Радзькова, Дз.С.Рудэнка, М.П.Савуноў, Я.М.Студзянічнік, Л.І.Сцешыц, Л.А.Тарабанава, Г.А.Турчынская, П.А.Чарнічэнка, І.І.Шабуневіч, С.І.Якаўлеў. **1991**. Т.І.Адамовіч, У.М.Дзядкоў, М.К.Балыкін, І.В.Барадзін, Г.Г.Бразінскі, І.М.Громаў, Э.С.Дзікевіч, У.М.Дзядкоў, І.З.Заяц, С.Я.Казлоў, А.А.Канцуб, В.А.Кузьміч, М.Р.Лысенка, А.С.Мазоўка, В.Г.Малевіч, У.І.Марцінкевіч, М.Ф.Мятлюк, М.М.Плескацэвіч, І.А.Пянькоў, А.П.Рабушка, Т.А.Раеўская, А.Р.Рамізоўская, У.М.Рэзнікаў, В.М.Сарока, С.І.Стралецкая, Н.С.Трафімава, Ю.К.Фамічоў, Ю.А.Харын, І.Я.Цішкоў, М.А.Цыральчук, Я.Г.Цярэшка, З.В.Шарэйка, А.В.Шашкоўскі. **1992**. Р.Д.Богнат, Р.А.Жмайдзяк, С.П. Зароўкін, М.К.Зубрыцкі, М.І.Каўганко, А.А.Лабуда, С.У.Ляпёшкін, В.А.Сізоў, Р.І.Тышкевіч, Я.А. Яворскі. **1993**. Л.М.Тараканава, Я.І.Тозік. **1994**. Э.М.Бабенка, М.М. Волкаў, А.І.Гайдук, І.М.Жарскі, М.Дз. Іванова, П.П.Кішкурна, М.М. Саўчык, В.П.Ярашэвіч. **1995**. М.Р.Кісялёў, А.І.Кочатаў, А.З.Латыпаў, Я.К.Мацюшэўская, М.А.Мікулік, А.В. Пякуцька, Б.М. Хрусталёў, В.У.Фядута. **1996**. Л.С.Герасімовіч, Э.М.Загарульскі, В.І. Карзюк, С.Р.Мулярчык, М.Я.Цікоцкі, Г.В.Шорап. **1997**. С.П.Гурко, А.М.Сапогін, М.В.Селькін.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК АХО́ВЫ ЗДАРО́ЎЯ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца ўрачам, навук. супрацоўнікам, сярэдняму і малодшаму мед. персаналу, правізарам, фармацэўтам, інж.-тэхн. работнікам, абслуговаму персаналу лячэбна-прафілактычных, санітарна-прафілактычных, санаторна-курортных, аптэчных устаноў, органаў аховы здароўя, н.-д., мед. і фармацэўтычных ін-таў, прадпрыемстваў, арг-цый, устаноў і аб'яднанняў незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці, якія працуюць у галіне аховы здароўя 15 і больш гадоў, за заслугі ў ахове здароўя насельніцтва, павышэнні якасці мед. дапамогі і лек. забеспячэння. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 29.10.1971 існа-

вала званне засл. работніка аховы здароўя БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

1972. Л.Дз.Атрадных, А.А.Барынава, В.А.Галушка, Л.І.Голікава, Г.Л.Грабянцова, А.М.Грахоўскі, А.Р.Ешукоў, І.І.Імянінская, П.А.Кавецкая, Л.А.Катрук, Г.А.Клімоўская, Г.С.Котава, М.С. Курыленка, В.П.Лабкоў, Л.У.Лук'янская, А.Ф.Любецкі, С.Дз.Ляхоўскі, М.Дз.Манкевіч, Т.В.Марынкіна, К.А. Мельнікава, З.І.Міхайлава, В.П.Паўлаў, Н.А.Паўловіч, А.Я.Савянкоў, Р.С.Самахвалава, В.П.Серафімовіч, М.І.Харламава, С.Ф.Харламава, Я.П.Цітова, У.К.Янцэвіч, А.П.Ярашэвіч. **1974**. М.Р.Арлоў, Г.І.Арцымовіч, А.І.Астроўская, Л.Т.Гуляева, Л.Б.Каламійцава, Н.М.Карабко, З.В.Красавіна, В.В.Крашчанка, І.С.Ладуцька, В.В.Макарчанка, М.Ц.Сідарэнка, Г.Ц.Фёдарава, В.М.Ціхун, К.Ф.Чартарыцкая, Г.І.Шастакова, С.І.Шпілеўскі. **1975**. Г.І.Аверчыкава, М.А.Амяльчук, Г.І.Арцёмчык, А.З.Баркоўская, Л.Ю.Дабрынеўская, М.В.Зацава, Т.І.Зіневіч, Л.Г.Прыходзька, М.К.Раманава, А.М. Рыбалка, Ю.Г.Сакалкоў, К.Р.Ферапонтава, Л.С.Фёдарава, Л.Н.Чайка, М.І.Чугункін. **1976**. Л.Ц.Амбросава, І.У.Верамчук, В.П.Герасіменка, Н.С.Дубіна, К.П.Казуціна, Г.К.Кастрыца, С.Р.Каўтун, Г.В.Крайнова, Г.І.Мартысевіч, М.М.Паньшына, П.С.Сакалова, Н.Л. Сакольчык, Н.С.Сафронава, М.Б.Станавенка, П.І.Учуватаў. **1978**. А.Ф.Акуліч, Е.І.Алешчанка, М.А.Бандарук, З.Р.Баравец, В.Ф.Бойка, Г.В.Бугаева, Н.М.Важнік, В.У.Ганчар, Н.Дз.Дзятлава, М.К.Жаркевіч, М.І.Корбут, С.А. Крэпская, Н.В.Маркава, Е.П.Міранович, І.А.Сашко, З.Р.Хадкевіч, А.Ц.Ціханава, С.М.Ціханчук, Н.С.Шульга. **1979**. Н.М.Акулік, Т.І.Байкачова, В.А.Восіпава, М.С.Галалобава, М.А.Генералава, Г.І.Дашкевіч, А.Ф.Дуброўская, Т.І.Жыгунова, Т.І.Зайко, З.Я.Зайцава, С.І. Іванькова, В.Я.Кавальчук, Т.С.Калугіна, Ю.П.Касач, Г.Д.Коршунава, Р.І.Красянкова, М.Д.Кужалева, М.Н.Кушнерава, Л.І.Львова, М.М.Майсейкіна, Н.В. Малкова, А.П.Манкевіч, Г.М.Некрашэвіч, М.С.Новік, Р.І.Панчанка, Л.К.Пузянкова, В.М.Пулькіна, І.П.Скакун, С.Дз.Чаркасава, В.Т.Чорная, Б.В.Шалькевіч, І.М.Шастакоў. **1980**. А.Д.Дрызгаловіч, Г.Ц.Крукава, Н.І.Ліпавецкая, В.С.Макоўская, А.Я.Маркава, В.М.Худзіцкая. **1981**. Р.І.Багдановіч, Г.З.Галавецкая, Т.І.Ганчарук, М.І.Гапінская, Т.В.Грынько, М.А.Даманская, Н.Р.Дзедунова, Н.В.Ільяшук, М.П.Кандрашоў, К.Дз.Кібенка, В.В.Крупец, М.А.Лінкевіч, З.М.Ляцецкая, М.І.Міцкевіч, К.А.Пратасевіч, Р.П.Пятрова, В.М.Сарока, В.С.Сушчэня, А.С.Танкель, Ф.С. Хурсан. **1982**. В.Э.Бароўская, Т.В. Гаўрыленка, В.І.Закіс, В.А.Камына, С.Дз.Кошаль, В.С.Мікуліч, В.М.Сучкова, А.К.Чмыроў, Л.І.Чыж, Г.Р.Шаўчук. **1983**. А.Т.Вялюга. **1984**. К.І.Асмалоўская. **1985**. Е.М.Кузьмінава, Н.У. Масанская, А.Дз.Міхайлава. **1987**. М.І.Еўхач, Л.Р.Лукашэвіч, Ч.Ю.Макрыцкая, Т.В.Пазняк, В.Дз.Паўлоўская, А.К.Саўко, Н.П.Скараходава. **1989**. В.І.Сазонаў, У.М.Цэбрыкаў, В.І.Шляпо, Я.К.Шчэрба. **1990**. А.А.Аверчанка, В.Дз.Баклагін, А.П.Бедрак, Э.М.Булучэўскі, В.В.Зюзянкоў, В.П.Ласы, В.В.Назарэвіч, У.Я.Уранюк. **1991**. І.І.Архіпчык, П.І.Ашурка, Н.Г.Бучумава, М.С.Бялевіч, У.С.Варабей, Н.Ц. Дзеблік, М.З.Івашкевіч, А.М.Каваленка, А.С.Кавалёў, Л.П.Кісялёва, Н.Я.Кошаль, В.М.Краіла, І.В.Лесечка, І.І.Місюкевіч, П.Л.Новікаў, С.А.Папоў, В.А.Ражко, І.Н.Усаў, Т.Р.Федарэнка, У.М.Шкурко. **1992**. М.Дз.Абозны, М.М. Дзятлаў, Н.Ф.Федарук. **1993**. Ф.М.Гайдук, І.І.Тарашкевіч. **1994**. М.А.Абрамаў, З.М.Багдановіч, У.М.Белазёрцаў, С.Ф. Блажко, В.П.Буевіч, В.К.Зневяроўская, С.М.Котаў, І.М.Музычка, В.І.Разанскі, Г.В.Раманоўскі, І.В.Ржэўскі, В.А.Ржаўцкі, У.С.Рускевіч, Ц.С.Хейлік, А.С.Хомчык, У.У.Шваронак. **1995**. Я.А.Сацішур. **1997**. Р.В.Ануфрыева, М.Г.Гардзеенка, Р.В.Леўчык, Л.У.Чэрнікава.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК БЫТАВО́ГА АБСЛУГО́ЎВАННЯ НАСЕ́ЛЬНІЦТВА БССР, гл. ў арт. *Заслужаны работнік сферы абслугоўвання Рэспублікі Беларусь*.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК ВЫШЭ́ЙШАЙ ШКО́ЛЫ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным выкладчыкам, работнікам ВНУ, мін-ваў і ведамстваў, якія непасрэдна займаліся пытаннямі навуч.-выхаваўчай і навук.-метадычнай работы, бездакорна працавалі ў галіне вышэйшай адукацыі не менш як 10 гадоў, мелі вялікія заслугі ў навуч.-выхаваўчай рабоце, зрабілі значны ўклад у справу падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў і актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета ад БССР 29.10.1971, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР; скасавана 23.11.1988.

Заслужаныя работнікі вышэйшай школы БССР

1971. А.Ц.Каравікоў, А.Я.Малышаў. **1972**. М.А.Бацін, А.А.Васілеўскі, А.І.Воранава, С.М.Гальдштэйн, А.Р.Гарбачоў, З.З.Дудзіч, Г.М.Кокін, А.І.Лавыш, Ю.К. Ландо, І.Д.Прахарэнка, М.Р.Філатаў, Ц.І.Шаломенцаў, Ф.П.Шмыгаў. **1973**. Ю.А.Васільеў, І.Ф.Камкоў, Ф.К.Курапаценка, Л.А.Сухарава, М.А.Хазяеў. **1974**. П.Я.Канапелька, Ц.Г.Нікулін, Ф.Ф.Порахаў. **1975**. М.І.Абрамаў, Т.Я. Дударава, У.У.Зубец, М.І.Касцюкевіч, С.С.Касцюковіч, М.А.Лісіцын, У.П. Локцеў, Дз.А.Лявончанка, В.Дз.Марозаў, У.І.Міронаў, В.М.Пузікаў, М.Т.Раманоўскі, І.С.Росман, С.Л.Саламаха. **1976**. В.А.Бандарын, В.Н.Вінаградаў, Ф.П.Вісюлін, Я.Л.Гельберг, У.Р.Івашын, Ф.М.Капуцкі, М.В.Наўчыцель, І.І.Саладкоў, Г.В.Хахлоў. **1977**. М.М.Акімаў, Я.І.Анацкі, А.В.Бадакоў, К.К.Барышнікава, С.М.Бялоў, С.М. Жамчужны, В.А.Жучкевіч, І.І.Казека, С.Р.Лагун, М.Ф.Лызікаў, Г.П.Макеева, Я.В.Рыжанкоў, А.А.Столяр, К.І.Сцепанцэвіч, І.А.Талкачоў, В.І.Халзакоў, С.М.Чарноў, М.А.Шытаў. **1978**. Н.І.Дарафеенка, Я.П.Кудрашоў, Я.Н.Мядведскі, П.А.Сыцко. **1979**. Ф.В.Баравік, А.М.Брагін, І.А.Ганчароў, І.А.Глубеў, К.К.Іскра, У.А.Калеснік, А.Ц.Караткевіч, Т.М.Курыленка, К.І.Моніч, Г.Я.Панкрац, Я.А.Семянчук, І.Н.Сіпараў, І.І.Сярова, В.М.Фамін, М.А.Храмовіч, Л.М.Шакун. **1980**. І.Ш.Гарфінкель, В.М.Ільін, А.А.Калікінскі, В.А. Каменка, У.К.Кільчэўскі, М.У.Кіслоў, А.М.Конанаў, В.С.Кудрашоў, А.М.Мацко, У.С.Пашчанка, І.Л.Пятровіч, С.М. Сцёпін, А.Ф.Хацкевіч, М.С.Цэдрык, А.Д.Янушка. **1981**. Я.І.Гурскі, А.П.Красільнікаў, М.М.Крывапустаў, М.М. Маёраў, У.І.Мазур, В.І.Мартавіцкі, М.Ц.Марчанка, І.А.Цвятаева, В.М. Шкурко. **1982**. А.М.Бардовіч, Л.І.Валаховіч, П.П.Дронь, І.П.Зяцькоў, В.В. Казлова, М.І.Лебедзеў, А.А.Логінаў, І.І.Марціновіч, У.Я.Навуменка, В.У. Некрашэвіч, І.Т.Рагаўскі, Р.М.Трухноў, І.В.Царук, В.Ф.Цікавы, А.С.Шуканаў, Л.А.Шульга, Ю.Р.Ягораў, С.Я.Янчанка. **1983**. Г.С.Глушчанка, Р.М.Карсека, І.Ф.Крук, П.І.Ткачоў, Т.А.Шчарбакова. **1984**. О.Я.Л.Бекіш, І.Дз.Чарнышэнка. **1985**. М.В.Тараткевіч. **1987**. В.Я.Зарэцкая, М.Ф.Капіч, І.Ф.Кудраўцаў, А.Р. Лахтанаў, В.П.Стрэльнікаў. **1988**. А.В.Багатыроў, В.І.Рэуцкі.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК ГА́НДЛЮ І ГРАМА́ДСКАГА ХАРЧАВА́ННЯ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным работнікам гандлю і грамадскага харчавання за працу ў сістэме дзярж. і каап. гандлю не менш за 10 гадоў, за асаблівыя дасягненні ў развіцці гандлю і грамадскага харчавання і ў паляпшэнні гандл. абслугоўвання насельніцтва. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 7.2.1966, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 23.11.1988.

Заслужаныя работнікі гандлю і грамадскага харчавання Беларускай ССР

1966. А.Ф.Анішчанка, І.П.Ахрэмчык, В.А.Балотнікава, М.З.Барада, В.П.Барыс, Б.І.Барысевіч, М.І.Борухава, М.П.Валодзін, Ф.Ф.Валодзін, Л.І.Варшаўская, П.Ф.Волкаў, М.К.Вялюга, І.Б.Герко, Н.А.Гранькова, У.К.Гушча, М.Ф.Дзямідава, Л.І.Драздоўская, Г.Е. Дубіцкая, Г.Р.Дудко, П.Г.Іванова, З.В.Кліміценка, А.І.Коўчур, Н.К.Красоўская, Д.В.Кудзь, І.І.Кулькоў, Я.П. Ляхаў, М.Я.Махаёва, М.К.Мацукевіч, А.Я.Мелкаступаў, М.Р.Міхайлаў-Грыцаў, Л.І.Наркевіч, Г.І.Перык, Р.І.Прэпесціь, Ф.Дз.Ропат, В.Ц.Скарабагатая, Я.І.Суслава, І.В.Талочка, І.А.Тапырык, С.Дз.Чухловін, В.М.Чыжонак, І.А.Чычэрын, А.С.Шаўроў, І.А.Шымановіч. **1967**. В.А.Асіпок, А.Х.Аўсеенка, Л.П. Барвінак, В.К.Зверава, І.І.Калеснікаў, М.П.Карташова, В.Ф.Конаш, Я.Е.Крэз,

С.Б.Лембрыкаў, Н.С.Семянюк, А.А. Трацэўская. **1968**. А.Р.Арастовіч, М.М. Багдановіч, З.С.Бадрова, Н.А.Балотнікава, Н.М.Бірукова, А.М.Бычкоў, Т.І. Вадаходава, Б.Р.Гельфанд, Л.Ф.Голубева, П.І.Гурына, Е.А.Забродская, В.А.Задала, М.П.Ігнацьева, В.М.Калур, Х.Е. Камінская, Т.С.Каськовіч, П.І.Катаводаў, І.А.Крамарэнка, М.А.Краўцова, Л.М.Кротаў, Л.І.Кручкова, З.М.Кузняцова, В.М.Кунцэвіч, К.Л.Ластоўскі, Г.А.Лукашэвіч, Г.С.Мазько, Г.С.Міранові, Л.М.Новікава, А.Д.Падаляк, Н.Г.Парфянкова, Л.С.Паўроз, І.М.Пілі пейка, М.Ф.Ружанцова, Н.С.Саракалетава, В.І.Свірыдо, В.К.Сцепаненка, А.В.Тоўкань, М.А.Хартонік, А.І.Хромава, Н.А.Шандрыгіна, М.М.Шастакова, А.Дз.Шубіч, Я.Ц.Шылаў. **1969**. І.Я.Бутрым, А.І.Паліўкіна, К.І.Палкіна, В.Д.Стрэж, Г.П.Сценнік, М.Я.Шведава, Г.Д.Якавенка. **1970**. Т.П.Абабкава, В.А.Бярозка, Н.І.Гутарава, М.М.Данілевіч, З.П.Кладкевіч, М.Я.Кудзінаў, З.Л. Ліхавідава, Н.М.Майдзецкая, В.М.Мяховіч, В.А.Папуша, Я.К.Станішэўская, К.С.Сыраквашына, В.М.Уласюк, К.Д. Шэлегава. **1971**. С.Ф.Ажахоўская, З.Г.Балашова, Л.В.Бутраменка, В.М.Воранаў, В.Ф.Галубко, А.А.Грузінаў, Н.Дз.Грыгарэўская, Т.Ф.Дзевятуха, А.І. Зарэцкая, У.М.Манаева, Е.І.Маслакова, С.С.Самахвал, К.І.Сапяжынская, К.І. Сіднякова, Н.І.Сусько, Н.С.Цішкевіч, В.К.Шаранкоў, М.С.Шумская, Т.П. Юркова, Н.С.Яжэлева. **1973**. А.Ф.Багданава, К.Ц.Біліеўская, А.А.Гладкая, І.П.Дзікун, Я.В.Крыштаповіч, Н.Р.Патройная, Л.С.Сарнова, А.Дз.Хадасок, М.П.Чартарыцкі. **1974**. Ф.І.Балашова, К.Я.Гаўрыленка, В.К.Зданоўіч, Т.Я.Камісарава, Я.М.Мананкін, В.Дз.Міхальчук, Г.Р.Навіцкая, Л.М.Федаракова. **1975**. В.А.Асмалоўская, А.А.Бажкоў, Н.І.Вярстак, І.С.Гарбузоў, Н.Н.Клімко, В.А.Кур'ян, Л.Ф.Ладуцька, В.А.Майсеенка, С.Ф.Масюцін, Л.Ф.Петрачкова, Л.І.Пракапенка, З.І.Прыступіна, А.А. Суслаў, К.Р.Удавенка, В.М.Шарыкава. **1976**. В.І.Алейчык, В.Ф.Еўтухоў, І.І.Ігошын, Р.В.Кузьміна, М.І.Лахтычкіна, І.П.Ляўковіч, К.С.Пашук, Я.С.Серая, Г.А.Сухій, В.В.Чарнякова. **1977**. В.Ф. Ачыновіч, В.П.Бальшакоў, Л.А.Вашчук, В.В.Кабачэўская, І.М.Калтовіч, А.А. Кардаш, С.Дз.Карпеня, Э.І.Кудасава, Т.М.Кузьменка, Н.М.Мацуганаў, Л.В. Міхневіч, Н.М.Навіцкая, Я.М.Новік. **1978**. Г.М.Ананчанка, З.М.Баравік, М.У.Галенка, А.А.Гласко, Г.П.Дзегцярова, П.В.Зюськевіч, В.М.Клімава, В.С.Лабажэвіч, З.К.Матняк, С.Ц.Пашчасцьеў, Р.Б.Рапапорт, Е.У.Рубцова, Т.І.Руднік, Г.І.Свідэрская, Ф.А.Цімкаева, М.В.Цярэшанкава, Л.А.Чыжова. **1979**. Г.М.Бяляўская, М.А.Вакульчык, Н.І.Варэнік, Н.А.Васілеўская, А.Т.Грыбалёва, Р.Ф.Даргель, Л.М.Емельяновіч, М.І.Крыўцоў, А.С.Курыленка, Л.І. Машталеж, А.С.Пархімовіч, К.Б.Пархоц, М.В.Сіроцін, Г.П.Стагурава. **1980**. Г.Д.Багнюк, В.А.Зянько, А.І.Корабава, М.П.Малочка, Р.Ц.Малочка, Г.Ц.Петракова, І.Е.Сталівоненка, А.М.Сыты, А.Л.Шатохіна, М.М.Якубоўскі. **1981**. Л.С.Зульцбург, А.Ф.Іваннікаў, Н.І.Казлоўская, С.Ю.Каравайка, К.І.Карчэня, Г.І.Кукарэка, Г.П.Латышава, Г.І.Марчанка, Н.Я.Матвеева, З.І.Пуцікава, І.В.Стукава, М.А.Хмель, М.А.Храбрая, Т.Ф.Царыкава, І.В.Шкляннік. **1982**. Т.К.Афанасенка, Ю.А.Васільева, Г.К. Дзеньшчыкова, Л.М.Селівончык, Л.В. Шыханцова, У.Я.Дзмітрычэнка. **1985**. Т.Ф.Бурая, М.С.Віннік, Н.М.Вітко, Р.А.Гмыза, М.Р.Голуб, І.Ф.Гурыновіч, П.Ф.Гуркоў, А.М.Драбышэўская, З.Г. Кацюбка, В.У.Кучанкова, Н.І.Серада, А.М.Цевашова, М.М.Фішнер, Л.Я.Худзеева, Т.М.Цэбрук. **1987**. Л.Е.Матвеева. **1988**. Л.Б.Андрэева, Г.А.Вадарацкая, М.В.Мірончыкаў, Я.Ф.Пляўкова, Н.І. Сахарчук, Я.І.Свірыд.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК ЖЫЛЛЁВА-КАМУНА́ЛЬНАЙ ГАСПАДА́РКІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным рабочым, інж.-тэхн. работнікам і служачым жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія бездакорна прапрацавалі ў галіне не менш як 10 гадоў і асабліва вызначыліся ў выкананні планавых заданняў і сацыяліст. абавязацельстваў, ва ўкараненні новай тэхнікі і перадавых метадаў працы, у далейшым развіцці мат.-тэхн. базы галіны, забеспячэнні захаванасці і паляпшэнні эксплуатацыі жыллёвага фонду і аб'ектаў камунальнай гаспадаркі, павышэнні эканам. эфектыўнасці вытворчасці, якасці жыл. і камунальных паслуг і культуры абслугоўвання насельніцтва, у справе падрыхтоўкі кадраў, і актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 28.7.1978, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 1986.

Заслужаныя работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР

1979. А.М.Федарэнка. **1980**. М.У.Аляксеенка, Г.А.Багданаў, Дз.Р.Мамоніцьеў, В.Дз.Марозаў, А.Ц.Міхаліцын. **1981**. У.Ц.Антоненка, Я.А.Асонаў, У.М.Кісялёў, М.П.Фальковіч. **1982**. Л.Б.Авяр'янаў, М.А.Казлоў, А.Я.Рагатка, В.А.Шэкун. **1983**. С.І.Галушка, М.П.Лысянкоў, А.А.Стэльмах. **1984**. В.А.Баркун, Г.В.Габрыянчык. **1985**. А.М.Акулін. **1986**. І.С.Каструбай.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК КУЛЬТУ́РЫ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным работнікам установаў культуры, кінематаграфіі, тэлебачання і радыё, друку, выд-ваў, паліграф. прам-сці і кніжнага гандлю, турысцка-экскурсійных арг-цый і ўстаноў і інш., якія працавалі ў галіне культуры не менш як 10 гадоў, за заслугі ў развіцці культуры. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 29.10.1971, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. З 13.4.1995 прысвойваецца званне *заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь*.

Заслужаныя работнікі культуры Рэспублікі Беларусь

1971. А.А.Кузняеў. **1972**. М.П.Ананьін, Г.А.Арцёменка, А.А.Асаевіч, М.А.Бабіч, М.Н.Будзько, Я.Г.Буракоў, А.М.Бяляеў, М.П.Валатковіч, Г.М.Верасаў, К.А.Галыня, Я.І.Гардзей, М.А.Грыгор'еў, В.М.Жыгалаў, Н.К.Захарава, Л.Я.Звездзачотава, Г.М.Іванова, В.І.Ігнацьеў, М.С.Карпенка, В.А.Кенгурава, М.Я.Колас, М.А.Лісіцын, Н.А.Літвінюк, У.С. Лукошка, А.Дз.Малочка, Р.Дз.Мацюшэнка, Р.Г.Мачулін, С.А.Міхальчук, М.А.Піваварчук, А.М.Плешавеня, М.П. Рубіс, М.І.Собаль, В.Б.Філіпскіх, Т.К.Хадкевіч, С.А.Цімановіч, Р.Л.Шапіра, Б.А.Шурын. **1973**. А.Г.Астроўскі, А.П.Жукаўскас, Р.В.Канавалаў, М.Л. Нагнібеда. **1974**. М.А.Антоненка, Г.Е.Барысаў, Ф.А.Бачыла, Я.Я.Глезер, В.І.Дзебалтоўская, П.Б.Жукоўскі, Б.Р. Зельцэр, М.І.Калачынскі, А.М.Кулакоўскі, М.П.Лобан, У.Н.Лупейка, А.А.Лютарэвіч, Ф.І.Люцко, В.А.Малевіч, А.А.Маркевіч, В.А.Мінаў, С.А.Нортман, П.М.Падкураў, Н.Е.Пашкевіч, В.І.Сіманава, А.Т.Сімураў, Б.У.Усцінаў, У.П.Шляхцін, Н.Л.Юшпрах. **1975**. І.М.Агееў, І.А.Алексяевіч, В.В.Барысава, П.В.Бельскі, У.Ф.Богдан, А.М.Вараб'ёў, Р.М.Вараб'ёў, М.Ф.Варвашэвіч, І.Л.Вінаградава, М.М.Гарміновіч, Л.М. Гурэвіч, А.П.Дземчанкава, С.І.Дробыш, І.С.Зайцаў, Т.А.Зелікаў, І.Д.Казека, А.С.Казлоўскі, А.П.Калачова, А.Г.Л. Каплан, А.М.Капусцік, К.І.Каралёў, А.Д.Колас, Я.Я.Красоўскі, В.Г. Курэпін, Дз.У.Кухарава, П.С.Лавецкі, І.П.Лагоўскі, Р.Дз.Лазарэвіч, М.В.Лапша, Р.У.Лахцянкоў, С.Дз.Лі, А.П.Мадзіеўскі, Дз.М.Марчанка, М.С.Мінянкова, У.А.Навіцкі, П.Л.Паноў, Л.І.Папковіч, А.Л.Петрашкевіч, Р.М.Піятухоўская, К.К.Плігаўка, Я.А.Руманоўскі, В.М.Савельева, І.А.Санкова, А.Ц.Цількоў, М.І.Цыбульская, А.М.Цяцерын, І.П.Чэрнік, Я.А.Штопа, В.Р.Шурпач, А.П.Шутаў, П.С.Шчадроў, Дз.С.Юракоў. **1976**. Л.І.Айзенштат, А.І.Анісовіч, І.А.Аношка, А.Ц.Аўдзееў, І.П.Вараб'ёў, А.М.Вінаградаў, Г.Л.Гарбачова, М.В. Гершман, А.К.Грэцкі, А.Е.Дрозд, Т.П.Здзітавецкая, В.Ф.Касцюкова, І.С. Качан, Я.Р.Клінава, У.Р.Лахтанаў, В.А.Ляшковіч, В.Л.Марцыёнка, К.І.Назарава, М.І.Наздрын-Платніцкі, А.І. Стук, В.Я.Цітавец, А.Р.Цярцічны, У.А.Шаліхін, К.П.Шылко, У.М.Юрэвіч. **1977**. Э.К.Агуновіч, Ю.І.Анейчык, А.Ц.Бажко, В.М.Барысевіч, П.Я.Белавус, А.А.Бялова, Ю.Р.Гразноў, В.І.Дашкоўская, П.К.Дубовік, Дз.І.Дудко, П.А.Жмайлік, М.М.Засінец, А.А.Здравенін, І.Ф.Карповіч, Я.Р.Кацнельсон, Г.І.Клёсава, В.Р.Кудзелін, С.Ф.Любчук, М.Я.Матукоўскі, І.М.Міцкевіч, І.А.Музычка, А.П.Нікіціна, М.А.Няронскі, Г.Л.Папоў, У.С.Перацяцька, Р.Ф.Самусенкава, А.Ф.Серы, Дз.У.Сталяроў, І.Ф.Сушко, І.М.Хвораст, В.К.Шарэцкі, В.Н.Шчадрына, А.В.Шылава. **1978**.

П.С.Абадоўскі, Ф.І.Агафонаў, В.І.Аркашаў, М.Д.Астаневіч, В.А.Белік, Р.М.Валькова, А.С.Васілевіч, Л.М.Васкаўцова, І.І.Гаўрылаў, І.І.Грамовіч, М.А.Грусман, Д.А.Дубінскі, М.В.Дыбкін, Р.С.Жук, Р.В.Жукава, З.А.Жураўлёва, С.М.Іонычава, П.Н.Кавалёў, А.С.Каткоў, З.Д.Колб, М.Н.Котаў, А.Ф.Кукарэка, В.С.Куляшоў, І.П.Куцко, У.І.Кушнер, В.М.Марозаў, А.Я.Міронаў, В.П.Мянжынская, Р.А.Немянкова, А.А.Раздзялоўскі, А.М.Радзіёнаў, А.Г.Ражкова, Ю.Л.Рыбчонак, У.К.Саковіч, Б.У.Сасноўскі, Т.І.Хапалюк, А.С.Харэбін, М.П.Чыркун, Р.В.Шкраба, М.Я.Ярмоленкаў. **1979**. А.Х.Асіпенка, А.А.Бажэлка, М.Г.Белісаў, Л.П.Болдырава, Ю.П.Ванаг, М.А.Варонін, Б.П.Гадуноў, В.С.Гарбук, М.А.Гарулёў, А.В.Дзебалюк, Т.Дз.Дулуб, А.А.Коласаў, Ф.В.Конышаў, В.С.Ляпеская (Палтаран), У.В.Мацвееў, М.Ф.Мельнікаў, Я.Р.Меркуль, Б.Я.Папоў, І.В.Пушкоў, У.В.Пятровіч, А.А.Савельеў, Т.А.Слесарук, К.І.Суботка, А.А.Тоўсцік, З.Ю.Цалуйка, В.Дз.Чанін, М.В.Шапалін, Р.А.Шаўчэнка, У.М.Шахавец, Н.Ц.Шпак, Г.І.Ярашэўская. **1980**. С.І.Ажыгін, Ф.А.Аксёнаў, В.І.Аламаха, А.К.Аляксеенка, М.І.Аляксееў, Г.С.Андрэева, А.С.Андрэеў, А.М.Антошкін, А.І.Арлоў, К.Г.Арцёменка, Р.І.Арыка, М.Я.Аўрамчык, І.І.Бадроў, В.К.Бандарчык, П.Р.Белікаў, А.А.Бірукоў, В.І.Бранавіцкі, У.Л.Бядуля, В.К.Ванчукевіч, Я.Ф.Васькова, І.Дз.Вятроў, П.К.Галаваты, М.М.Гаранскі, А.М.Гарбачоў, Р.А.Гарленка, С.І.Гуляева, А.В.Далжонак, П.М.Дамброўскі, М.У.Дарафеенка, П.Т.Дземчанка, В.Дз.Дончык, І.С.Жыгараў, З.С.Зайцава, І.К.Захараў, У.А.Захараў, П.В.Збароўскі, А.Г.Зенін, М.Ц.Іваноў, Ф.С.Кавалёў, М.С.Карнееў, А.Н.Карпюк, М.І.Касарэнка, Дз.А.Кіргетаў, Ф.М.Клецкін, І.Ф.Клімаў, Ф.Дз.Конін, А.С.Кулага, Л.М.Кулакоўская, С.І.Кухараў, К.І.Лобач, Н.К.Логвіна, В.А.Лявончанка, М.В.Лянін, А.Р.Мазанік, І.Ф.Мальцаў, М.А.Мармалюкоў, А.Н.Марціновіч, А.І.Махнач, Р.Н.Мачульскі, П.М.Машэраў, П.С.Мікуленка, А.М.Міцюля, Ю.М.Новікаў, М.Б.Осіпава, В.І.Пакумейка, С.А.Пранько, В.А.Пырх, А.В.Пысін, А.М.Ракавец, Д.М.Раманюк, А.Дз.Рудак, В.М.Савін, Ц.Е.Саладкоў, Г.І.Станіслававa, Т.М.Стрыжак, М.П.Стрыжонак, М.А.Суша, П.В.Сяргейчык, А.В.Такмянінаў, Г.Р.Цішэвіч, В.І.Чалоўскі, Я.А.Чарняўская, С.І.Чыбісава, В.А.Шаўлак, М.І.Шматкоў, Е.С.Шурпач, Я.К.Шуціла, А.Я.Юшчанка (Алекса Юшчанка). **1981**. М.С.Арэхва, Г.М.Галубовіч, В.М.Губарэвіч, А.Р.Дрозд, М.І.Каменскіх, М.І.Карпенка, А.М.Кацкель, В.М.Краўчанка, А.І.Кузьміч, Ф.Ф.Лагвіновіч, А.С.Ліпскі, В.М.Макарэня, І.Я.Маслан, Ж.М.Міронава, В.Дз.Нікалаенка, С.А.Пульманоўскі, Н.Ф.Рыдзеўскі, У.І.Салашэнка, А.І.Смірноў, В.А.Сувалава, Г.Я.Цыганкоў, І.Ц.Чарняўскі (Ігнат Дубровскі), М.А.Шырокаў. **1982**. Т.А.Абакумоўская, І.У.Арахоўская, А.С.Аўрынская, Л.С.Барадулька, М.М.Ваданосаў, Р.І.Валынец, Ц.М.Гурэвіч, Я.І.Ждан, А.С.Захарошка, В.А.Казлоў, Л.Р.Кісялёў, Г.М.Конанаў, В.Ф.Маеўскі, І.А.Мандрык, Р.Я.Матусевіч, І.В.Міхневіч, К.А.Мішанава, І.А.Муравейка, А.С.Палубінскі, М.А.Парахоўнік, І.А.Сініцына, Г.І. Стрыха, І.М.Ступнікаў, П.А.Суткаленка, П.П.Сущко, Г.І.Харошка, С.А.Ходас, Р.Л.Чарахоўская, У.Т.Шайдук, І.І.Шылько, П.В.Янушка. **1983**. А.С.Бурдзялёў (Аляксей Русецкі), С.І.Грахоўскі, Л.М.Карамазава, Р.С.Паповіч, І.М.Пташнікаў, З.К.Скачкоўская, А.М.Сысоеў, І.П.Хаўратовіч, С.П.Шушкевіч. **1984**. С.Х.Александровіч, М.М.Афонін, Л.А.Валковіч, Б.П.Гарнастаеў, П.Р.Калеснікаў, Н.С.Ляпілава, М.М.Назараў, В.І.Сінчылін, Ф.П.Стэльмашак, Г.А.Суслаў, А.П.Уладзіміраваа, У.П.Чаркасаў, К.С.Чыкаў, А.Д.Шчарбакоў. **1985**. Э.В.Аўраменка, А.Я.Варын, С.Я. Гурыч, М.І.Клебановіч, Ф.С.Міхалёў, Ф.Ф.Пісарук, І.Я.Прыліпка, У.С.Садзін, І.А.Скрыган (Янка Скрыган), В.М.Смірноў, У.А.Толкач, А.Р.Хадарын, М.М.Шыманскі, У.Н.Яцко. **1986**. У.М.Гром, А.Д.Клімовіч, Э.П.Луканская, Л.А.Нечыпарэнка, А.К.Рамановіч, А.І.Савіцкі, А.К.Сульянаў, У.В.Таран, М.Ф.Ягораў. **1987**. М.П.Агароднікаў, С.А.Аслезаў, С.В.Барадоўскі, А.М.Белакоз, А.У.Богуш, С.А.Галаўко, Ю.М.Іваноў, П.С.Каваленка, С.У.Клімянценка, Я.В.Малашэвіч, М.Ф.Нікіцін, В.В.Тупіцын, М.В.Шоба. **1988**. М.А.Дэйка, М.І.Дзялец, В.І.Ермаловіч, Я.А.Крыскавец, А.Р.Курачкін, Т.М.Курыла, А.І.Марозава, Л.А.Міхайлідзі, У.І.Пруднікаў, С.П.Самуэль, Р.С.Сарока, Ф.Р. Шкляраў, Дз.П.Юхнік. **1989**. В.Я.Балаханаў, Л.А.Валчок, Э.І.Герасімовіч, П.С.Дурчын, У.М.Душкевіч, П.В.Елец, К.М.Лімарэнка, Я.Я.Лявінскі, А.С.Міскевіч, А.А.Мошчанка, Ю.І.Нікалаеў, М.М. Нядбайла, Г.А.Сакалова, В.В.Саўчанка, І.І.Семяжонаў (Язэп Семяжон), З.А. Танклеўскі, М.І.Трафімук, І.Я.Фяцісаў, Г.П.Чысцякова, А.А.Шагаў, Р.Я.Шацаў, В.У.Яўстратава. **1990**. В.А.Бабчанка, А.І.Барданаў, К.П.Батракова, І.П.Галко, В.А.Губіч, М.М.Дубінін, А.С.Жукоўскі, Н.І.Жураўленка, С.В.Звалінская, В.Б. Зелянко, Р.С.Зыкава, У.І.Казакевіч, І.А. Канаплянік, Г.М.Качалава, Я.Я.Квачаў, А.С.Костылева, М.М.Кузняцоў, У.В.Курылін, М.Я.Ленсу, А.М.Маліцкі, В.К.Мацкевіч, К.Ц.Мельнікава, М.Я. Мінін, М.М.Наско, А.У.Нікалайчык, Г.П.Обух, М.І.Падабед, А.В.Папоў, Т.П.Рашчынская, Т.Д.Рудова, В.М.Сяліцкая-Нікітчанка, К.М.Турына, Р.Р. Храпуцкі, М.С.Царкоў, Э.Р.Шчыры, В.П.Ямінскі. **1991**. У.Дз.Бараноўскі, Я.Я.Бацяноўскі, Я.М.Быткоўскі, А.А. Бянько, І.І.Вашкевіч, А.І.Вярцінскі, А.І.Гатоўская, Р.Ф.Герасімовіч, М.Р.Дарашкоў, Н.Р.Дземянчук, Р.В.Дубікаў, П.Б.Звонак (Алесь Звонак), Л.П.Кацлазарава, Г.М.Ліхман, М.П.Мацкевіч, Р.Я.Пармон, У.М.Правалінскі, У.Р.Правасуд, Я.С.Раманаў, В.Р.Раманцоў, Н.І.Салдатава, П.І.Свярдлоў, В.С.Семенякоў, Л.К.Толкач, Г.Дз.Чорны, Т.І. Шахновіч, В.П.Шымчонак, І.С.Янкоўскі. **1992**. А.Н.Аўрамчанка, В.Дз.Васіленка, Ю.С.Васільеў, У.Р.Громаў, Ц.М.Дамашэвіч, В.Ф.Жукоўскі, Н.С.Загорская, Л.Ф.Мельнік, А.А.Мурзіч, П.І Прудніка ў, Ю.В.Пучынскі, І.Дз.Сухан, А.У.Тамашэўскі. **1994**. С.А.Андрэюк. Э.С.Валасевіч, А.М.Ваніцкі, А.А.Зарубіна, А.К.Клышка, Ч.У.Клячко, Ф.І.Савіцкі, С.К.Сцефановіч.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК НАРО́ДНАЙ АДУКА́ЦЫІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, гл. ў арт. *Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК НАРО́ДНАЙ АДУКА́ЦЫІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, гл. ў арт. *Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК ПРАМЫСЛО́ВАСЦІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высакапрафес. рабочым, майстрам, інж.-тэхн. работнікам прадпрыемстваў, аб'яднанняў, н.-д., праектна-канструктарскіх і інш. арг-цый розных галін вытв-сці, работнікам органаў кіравання прам-сці, якія працуюць у прам-сці 15 і больш гадоў і зрабілі значны ўклад ва ўдасканаленне тэхнікі, тэхналогіі і арганізацыі вытв-сці, у дасягненне высокіх паказчыкаў якасці прадукцыі, павышэнне прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытв-сці. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1971 існавала ганаровае званне засл. работнік прамысловасці Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі прамысловасці Рэспублікі Беларусь

1972. Ф.Ф.Байкачоў, П.І.Байкоў, П.П.Белы, М.П.Бераснёў, Ф.І.Бойка, А.А.Бужынскі, І.І.Бяспалава, М.Е.Гаўрылаў, К.Р.Давыдок, І.І.Дземчанка, В.К.Жукоўскі, А.Ф.Загаецкая, В.А.Зубенін, П.І.Індан, А.В.Казанцаў, К.І.Калывайлава, Г.Ц.Кузняцова, Л.В. Малышкіна, А.І.Папоў, Р.І.Плашэй, В.А.Помазава, А.Р.Пракаповіч, П.С. Раждаеў, С.С.Раманенка, В.Я.Раманоўскі, М.Ф.Рухлінскі, П.П.Сабалеўскі, У.С.Семяніхін, М.А.Сінкевіч, М.М. Слюнькоў, Г.А.Сляпцоў, Я.І.Ступак, В.А.Сысоева, Г.В.Сямёнаў, А.П. Тоўсцік, М.А.Фядзюк, М.М.Хаванскі, Ю.І.Хейкер, А.І.Хоміч, Ц.Я.Церахаў, Б.Л.Шапашнік, А.І.Шчарбакоў, В.М. Шчарбіна, М.П.Ямелечава. **1973**. Г.П.Алейчык, С.І.Аўсіевіч, Н.З.Баброў, Ф.І.Багданаў, І.М.Брэль, В.М.Буткевіч, А.Я.Высоцкі, Я.Ф.Гайваронскі, А.П. Гайдук, В.Л.Гарох, А.У.Грытусь, А.В.Грэлаў, А.Р.Гурскі, В.А.Жукоўскі, І.А.Кадурын, І.І.Караткоў, В.М.Кармілевіч, С.П.Кароль, Г.Ф.Карпенка, Дз.А.Кіеня, А.А.Кузаўкоў, А.Ф.Лапцюхова, В.Т.Майсееў, В.Ц.Прохараў, У.А.Ражкоў, В.Я.Семянкоў, Р.І.Тубалец, С.К.Ціханскі, У.І.Чэрнікаў, В.К.Шам-

гін, І.Р.Янкоўскі. **1974**. Л.А.Багданаў, А.Ц.Баранава, А.І.Белавусаў, Г.І.Васілеўская, М.П.Галяева, М.І.Гулевіч, М.Ф.Дзяркач, П.І.Казлоў, В.М.Качынскі, С.М.Кішкін, Я.І.Клімчанка, Г.М.Красніцкі, Ф.Т.Крывянкоў, І.В.Кудраўцаў, Ф.І.Кузняцоў, А.С.Лаўрэнаў, М.М.Матохіна, В.Д.Новікаў, П.І.Паўлаў, Дз.І.Пятроў, Н.А.Сафонава, П.П.Сяргееў, Дз.Ф.Хітраво, К.Ю.Цярэшка, М.Д.Шахаленка, Г.Н.Юпатаў. **1975**. М.І.Агапаў, С.Ф.Азёрны, А.М.Акуліч, С.У.Антонаў, Л.І.Багдановіч, Б.Т.Барэйша, М.К.Белакурскі, Р.Е.Бондараў, Я.А.К.Брэд, Б.В.Бурэўскі, С.А.Бухаў, Т.А.Бялькова, С.В.Бяляеў, І.М.Валікаў, В.Дз.Вятошкін, А.В.Гарачкін, М.Дз.Гарохаў, В.В.Герман, В.Ф.Гнілягін, П.І.Грэцкі, І.П.Губачоў, У.Д.Гулаеў, М.С.Гулевіч, Б.А.Данілаў, Г.Я.Данілкін, С.А.Дзюбянкоў, Л.І.Дзянісава, Дз.П.Дубіна, Л.С.Жывіца, А.А.Жыткоў, Ц.М.Захаранка, Ц.Ц.Зелянко, І.М.Ільінская, У.Г.Каваленка, І.П.Каета, У.С.Казлоў, Е.А.Каласоўская, В.А.Калінкін, С.І.Калыбельнікаў, Я.Ц.Камарыст, П.І.Караткоў, В.А.Качан, М.А.Крашэўскі, В.С.Крыцкі, А.П.Кузняцоў, А.В.Кузьміч, В.М.Кузьмянкоў, Г.С.Кукшынскі, М.І.Ларыёнаў, І.І.Ліпін, Б.А.Лукошнікаў, Ф.П.Лук'яненка, М.В.Малахаў, І.С.Малашка, А.Я.Масальскі, М.М.Мацвееў, П.З.Меркін, М.П.Мішчанка, А.Е.Нікіфараў, Н.Ф.Пазнякоў, П.А.Палухін, І.Я.Паляціла, С.А.Пракопчык, В.А.Прыдарожны, А.І.Прыходзька, Р.Я.Рагожын, І.Ф.Сакалоў, Р.І.Сафронаў, В.А.Селязнёў, Г.В.Семяніхін, Л.С.Слаўк, Р.Г.Сушанцоў, І.М.Сушчанкоў, Л.А.Углік, В.В.Урусаў, Я.А.Фурман, В.Я.Фурукін, К.М.Халошын, М.І.Хвашчынскі, Ш.Х.Хуснутдзінаў, М.С.Цітоў, Б.М.Чаркасаў, М.А.Шавялёў, У.К.Шаркоў, Я.Ф.Шкіндар, М.В.Шпортаў, А.К.Шчурак, Г.С.Югаў, У.Е.Юрчанка. **1976**. А.П.Авечкін, Н.А.Аксёнава, М.У.Алісевіч, У.П.Андрушчанка, К.А.Андрыянаў, Л.С.Ахацімская, М.Ю.Баранаў, С.І.Бардзілоўскі, В.І.Бароўскі, І.А.Барысевіч, В.І.Беражны, А.М.Быкоўскі, К.М.Бялянка, У.Я.Вайцюк, М.К.Васіленка, І.П.Васільеў, М.І.Гайдук, А.М.Галішнікаў, М.С.Ганчароў, І.А.Гацко, Л.Р.Глазкоў, Л.Р.Грышанава, Р.Д.Гулько, І.Ф.Гурэеў, Э.І.Дземідок, Н.С.Дунаева, І.С.Жукаў, В.І.Забела, Л.Т.Згорскі, Б.С.Зубаў, В.М.Ільіна, А.С.Каваленка, В.А.Калашнікава, М.Я.Капшукова, В.Л.Карнілава, Р.П.Кеніг, А.Г.Кіеня, І.У.Кіеўскі, З.П.Кіжнярова, М.П.Кісялёў, А.А.Ключнік, Я.М.Козыраў, А.М.Кроўз, У.Ю.Крыкун, З.І.Крымава, В.А.Кубасаў, В.В.Кузьмічоў, В.А.Лазерка, Э.С.Лешчанка, В.А.Лынчанка, А.І.Ліцвінаў, М.Я.Ляскавец, П.В.Лящчынскі, Л.І.Малеша, У.І.Мальто, М.І.Манастырскі, М.М.Мацюшын, А.П.Непагодзін, М.П.Нікалаенка, І.М.Нікалайчык, Ц.В.Нікулін, А.Н.Падабедаў, Х.Л.Падмаскоўная, Ю.Д.Панамароў, Я.Р.Папоў, Н.І.Парадня, І.Я.Паўлючэнкаў, М.А.Пузыня, В.Я.Пятрэнка, Г.А.Рабцаў, І.І.Растаргуеў, В.Р.Рыбалка, В.П.Рэзнік, Р.І.Савіцкая, В.С.Сакалова, М.І.Сінкевіч, В.М.Слюнькоў, Г.Дз.Смірноў, В.С.Сяргееў, Л.Д.Татарынаў, Дз.М.Ткачоў, В.Д.Хадакова, К.І.Хацука, А.А.Чарняўская, У.А.Шкабарын, Л.І.Шунякоў, І.Е.Шчарбінскі, В.Ф.Юркавец. **1977**. У.М.Алейнікаў, Г.П.Андрэеўскі, Я.С.Афаневіч, Н.Дз.Бакштай, Л.І.Вышынская, Л.Я.Гаранская, Л.Я.Гарэлік, Л.П.Жураўлёва, Р.П.Жураўлёва, С.Я.Званароў, В.А.Ігнацьеў, М.А.Козел, Я.М.Мухамор, М.Ф.Мясаедаў, А.М.Прус, М.П.Пухаў, А.Дз.Севасцьянава, Э.І.Сцепанічэнка, М.Я.Сцяпанаў, А.С.Цітоў. **1978**. М.М.Барадулін, М.І.Батура, Г.А.Быкоўскі, Л.Ю.Беляновіч, З.Л.Гдалевіч, Л.І.Грыгор'ева, А.Ф.Дзяржынская, В.В.Івашка, В.Дз.Івойлава, Р.П.Кавалеўская, Л.У.Карцяновіч, Т.А.Клачан, М.І.Коршунава, Ч.А.Круглінскі, А.П.Парфёнава, А.С.Рабінскі, Р.В.Рак, Я.У.Рачынскі, А.А.Санчукоўскі, А.Л.Стоцкі, Г.П.Цвяткоў, Л.С.Цыбульская. **1979**. М.В.Анібраева, З.П.Адашкевіч, Я.В.Вайцяховіч, В.М.Дрозд, Т.П.Жалабковіч, Б.І.Кабзар, А.С.Кавалёў, М.Ф.Казакова, М.А.Кудзін, У.Ф.Куракоў, Н.І.Макушкіна, І.М.Мігун, Я.А.Мікуловіч, У.П.Патоцкі, Я.С.Пратасевіч, Л.І.Рышчук, А.А.Сігаеў, М.Т.Тарасаў, Л.Ф.Трусава, Н.Ф.Храпцова, Г.К.Цапаеў, В.С.Чарняцоў. **1980**. З.В.Белагуб, П.Д.Біліда, М.Ю.Габрусь, А.М.Гушчо, В.П.Давыдоўскі, М.П.Зданевіч, Я.С.Ізафатава, А.П.Калошын, А.Я.Кіўкоў, У.У.Лішык, Я.А.Мажэева, Н.С.Мароз, Н.І.Пашкевіч, Р.В.Пятроў, І.І.Рак, І.М.Сакалоў, Н.І.Сакалоўскі, Л.П.Улаховіч, В.В.Федуковіч, Я.І.Шафір, Р.І.Шчарбакоў, В.А.Шылец, А.І.Ярэй. **1981**. М.І.Акімаў, В.Ц.Арбузаў, А.Г.Зязюлькін, М.Ф.Іофе, С.Л.Карзюк, Р.С.Кірыенка, Я.В.Крывулька, С.П.Крыжэўскі, У.Д.Ліфшыц, Т.В.Лятун, І.І.Малчанаў, А.У.Мацкевіч, В.В.Нідзелька, А.Ф.Рудзінскі, Л.А.Чачот. **1982**. В.М.Аляксеенка, С.С.Барадоўскі, Л.П.Бубноў, В.П.Булава, Л.В.Варанцова, Л.В.Варэц, А.П.Гусар, У.А.Іваноў, Н.П.Каралёва, М.А.Качко, А.Ф.Крываносаў, П.Ф.Макараў, В.В.Машчук, Г.К.Пераліцкі, Г.І.Савановіч, М.П.Сакіркін, З.П.Сідарэнка, А.С.Сладкова, Э.І.Смага, А.В.Хламянок, Н.К.Хоцькіна, С.Ф.Цура. **1983**. І.С.Бартосік, С.П.Вярбоўскі, Л.Я.Гардзяюк, Г.І.Гулей, В.Ф.Дзянішчанкава, І.С.Жукоўскі, А.П.Кавальчук, В.І.Карасцялюк, А.П.Кацапаў, Р.В.Конюх, В.А.Майко, М.П.Марозаў, М.П.Накоўнік, А.І.Трушкіна. **1984**. С.М.Аляксейчык, А.І.Бацюлеў, М.С.Берышвілі, Н.У.Валовік, В.А.Жукавец, В.С.Падгарэцкая, У.А.Сітаў, У.Я.Чвялёў, Т.І.Шалянок, Р.А.Шчаглова. **1985**. М.Ц.Антонік, С.А.Ахрэмчык, У.І.Блаў, А.У.Жыткевіч, В.У.Забаронак, А.М.Запольскі, І.У.Казанцаў, Л.А.Канавалаў, Л.М.Нагібовіч, М.А.Сідараў, В.М.Сліж, Т.С.Хрытанькова, М.Я.Чуманіхіна, У.А.Юрганаў. **1986**. М.Т.Барабанаў, Ю.Дз.Барадоўскі, А.М.Біёнчык, Л.І.Грышын, Г.С.Папова. **1987**. М.І.Кандзіраыда, Г.І.Лазарашвілі, У.М.Сямёнаў. **1988**. Я.К.Баран, П.Ф.Белагураў, С.Ф.Гашко, Э.А.Геуркаў, У.В.Грыдзюшка, Ю.Я.Данешчык, М.Д.Ермалаеў, В.В.Кавальчук, Т.В.Караткова, У.В.Качан, В.М.Краўчанка, А.М.Крывенка, І.І.Куляшоў, Э.К.Мядзведзеў, В.А.Пятроў, З.П.Саковіч, І.У.Смалей. **1989**. М.П.Бялько, М.М.Валькоў, Ф.К.Голуб, В.Дз.Жагальскі, Л.І.Кадолка, І.І.Карнілаў, М.Ц.Лучнікаў, У.П.Піліповіч, С.П.Сінельнікаў, В.В.Собаль, В.М.Царанкоў, Л.П.Яноўскі. **1990**. З.Ф.Бузуноўскі, Л.Ф.Ідзіятуліна, Г.А.Ісаевіч, Ю.М.Канавалаў, Т.С.Ліпатнікава, М.Я.Манголеў, С.Б.Сімховіч, В.І.Сініцкі, Л.А.Тараканава, Г.М.Хартановіч, М.А.Цітоў, А.А.Шарубін, В.У.Шчамялёва, П.Л.Шыла, Г.Р.Яцкоўская. **1991**. Л.С.Арыніч, У.М.Аўчыннік, П.Р.Балдоўскі, А.С.Белавус, С.А.Вернікоўскі, Ш.С.Грыгар'ян, І.А.Карпаў, Г.А.Курыльчык, У.П.Лапыка, П.З.Літвінчук, А.А.Лявошка, У.І.Масюкевіч, І.С.Муліца, С.М.Паліцкая, С.А.Пеліх, А.А.Сямёнава, М.І.Цярэшка, К.К.Шабунеўскі, А.С.Шыбаеў, В.У.Эсаулаў. **1992**. У.П.Кудрыцкі. **1993**. М.Т.Бялко, Ч.А.Дудчык, У.І.Лежань, М.У.Саўко, У.М.Шэпель. **1994**. У.В.Абрамчык, У.В.Ачапоўскі, З.В.Валеха, В.В.Вінакураў, А.Е.Гайдук, Л.А.Гармаш, А.К.Герасімовіч, А.У.Грэбень, У.Я.Давыдкоў, А.М.Далінін, А.А.Данілін, М.Л.Дворкін, І.І.Журовіч, В.Я.Кавалевіч, В.А.Кавалёў, З.М.Капіхава, Л.Б.Калодны, Л.І.Калугін, Ф.І.Канстанціновіч, У.У.Карсакоў, Г.Р.Катомкіна, Ю.Р.Кісялёў, Л.П.Козік, А.М.Лапко, У.У.Ласкевіч, У.В.Ляўданскі, М.І.Лобач, А.Г.Максімовіч, С.І.Малахаў, В.А.Найдзёнак, П.М.Новікаў, У.У.Рашатко, М.А.Сайчык, М.Н.Сліж, Н.Д.Тоўсцік, У.П.Філіпаў, Л.С.Чартоў, Т.К.Юрэвіч, Б.Б.Янкоўскі. **1995**. А.Ц.Ваўчок, С.А.Венцкі, Л.А.Воўк, М.І.Зінавенка, У.Ф.Каленік, Г.У.Карло, М.Я.Паўлаў, В.І.Рулеў, П.У.Скабіцкі, М.М.Скарбец, А.І.Фёдараў, У.А.Філіпаў, Дз.І.Чачко, А.І.Чыж, Л.Г.Шавель. **1996**. В.А.Астапенка, Я.І.Бабініч, А.І.Белы, Т.У.Булдык, В.А.Бурскі, В.У.Бухавец, А.М.Бярозкін, Б.В.Вайтовіч, А.У.Вержбаловіч, У.С.Дзегцяроў, У.М.Дзялендзік, Г.С.Драбышэўскі, У.В.Зубовіч, Р.А.Калінкін, Р.П.Капыткo, Р.М.Нургалееў, А.І.Прыходзька, М.І.Пузыроў, С.У.Сарока, У.В.Скобаў, У.С.Хмялеўскі, В.Р.Чарткоў, В.В.Шапецька, А.А.Ярковіч. **1997**. Л.Ф.Барабанаў, М.П.Белы, Л.П.Быкоўскі, В.Б.Вернікоўскі, Л.К.Калюка, Р.Ф.Карабанаў, В.Дз.Марыніч, С.С.Сідорскі, С.П.Сапута, С.Б.Снітко, У.П.Стайчанка, С.Х.Федарук, В.А.Шурынаў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК ПРАФЕСІ́ЙНА-ТЭХНІ́ЧНАЙ АДУКА́ЦЫІ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным майстрам, інспектарам, інжынерам і інш. работнікам, што бездакорна пра-

цавалі ў сістэме прафес.-тэхн. адукацыі не менш за 10 гадоў і асабліва вызначыліся выхаваўча-пед. дзейнасцю, дасягнулі выдатных поспехаў у справе камуніст. выхавання і прафес. навучання моладзі, актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 29.10.1971, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР; скасавана 23.11.1988.

Заслужаныя работнікі прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларускай ССР

1972. М.П.Мельнікаў, М.Г.Суворaў, Б.Л.Яронскі. **1973**. Б.М.Балуеў, М.К.Гаварушкін, І.А.Хандога, М.Г.Цырульнікаў. **1975**. Б.А.Аўгусцінавіч, Т.Б.Бандэвіч, В.І.Восіпава, У.М.Грыцкевіч, В.Н.Жывуля, Н.І.Задора, Д.Г.Іргер, М.Р.Маглыш, В.У.Мельнікава, І.Дз.Расолька, Г.М.Самарцаў. **1976**. А.Э.Бараноўскі, Я.І.Гаварушка, Я.М.Даманікаў, А.Н.Джураў, Л.А.Окунь, М.Л.Родаў, Р.В.Супрановіч. **1977**. В.Ф.Бакштаеў, В.І.Бардзілоўскі, У.С.Беласоўскі, В.Ф.Валуевіч, І.І.Вырадаў, С.Ц.Галынскі, М.С.Дзмітрышына, М.А.Лычкоўскі, П.А.Румянцаў, А.У.Траўнік, Л.І.Чарненка. **1979**. Л.Е.Белякоў, Н.П.Батэзат, А.І.Далматовіч, Г.П.Дубоўская, С.А.Калеснік, З.Ф.Пятровіч, Я.Т.Таранаў, Я.М.Талмачоў. **1981**. М.К.Альхіменка, Н.А.Кузьміна, М.С.Лушчакоў, Я.Я.Шостак, К.М.Якубіцкі. **1982**. А.І.Дубовік, А.М.Лапкоўскі, Н.І.Рэдзька, Н.Н.Самойлава, А.С.Сянчук, Г.С.Сухабокаў, Г.М.Шыбко, М.М.Якубёнак, А.А.Ярмаловіч. **1984**. А.А.Бельчанкава, Р.А.Еўзельман. **1985**. А.А.Клімін, А.Л.Краснабаеў. **1987**. Л.Ф.Дрозд.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК САЦЫЯ́ЛЬНАЙ АБАРО́НЫ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь высокапрафес. работнікам органаў, устаноў і прадпрыемстваў сістэмы сац. абароны насельніцтва, што працуюць у гэтай галіне 15 і больш гадоў, за заслугі ў арганізацыі сац. дапамогі грамадзянам, іх пенсіённага забеспячэння, укараненні розных форм і відаў дабрачыннасці, развіцці навук. даследаванняў па найважнейшых кірунках сац. абароны насельніцтва. Установлена 13.4.1995. У 1981—88 існавала званне засл. работнік сац. абароны Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь

1981. В.В.Алфёраў, М.У.Алфіменкава, В.Дз.Дзенісевіч, З.С.Ермаковіч, Ф.П.Жураў, Ю.М.Заруцкая, М.У.Зуёнак, І.П.Карбоўскі, К.І.Клюцавая, Л.В.Кожар, В.Г.Кончыц, М.А.Косарава, М.П.Лук'янаў, К.В.Маршаленка, П.В.Мацяцюк, Р.Ф.Попчанка, М.С.Садаўнічы, С.З.Серакова, М.С.Хулялеў, М.А.Ціцкая, М.П.Шарко. **1983**. В.І.Баранкова, Л.А.Садзіна. **1985**. А.Р.Шапуля. **1996**. Я.І.Папко. **1997**. Ф.Л.Гольдшміт.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК СЕ́ЛЬСКАЙ ГАСПАДА́РКІ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафес. работнікам сельскай гаспадаркі, у т.л. работнікам фермерскіх гаспадарак, органаў дзярж. кіравання, н.-д. устаноў, прадпрыемстваў, арг-цый і аб'яднанняў, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку і працуюць у галіне сельскай гаспадаркі не менш як 15 гадоў, за заслугі ў павелічэнні вытв-сці і рэалізацыі с.-г. прадукцыі, забеспячэнні паспяховага функцыянавання с.-г. прадпрыемстваў. Установлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1971 існавала званне засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі сельскай гаспадаркі Беларускай ССР

1972. І.В.Піліпенка. **1973**. І.Л.Бабіцкі, К.Дз.Балай, У.Р.Барысаў, Дз.П.Белавусаў, Н.Я.Бяляўская, Б.В.Венядзіктаў, У.П.Гаўрыленка, М.Дз.Грачышкін, В.А.Грыгор'еў, Г.Л.Дзмітровіч, М.М. Дземідзенка, І.Дз.Дульскі, І.Б.Жалток, П.І.Жукоўская, А.Г.Жураўлёў, В.У.Загароўская, Т.Дз.Кавалёва, А.Я.Каліноўскі, А.У.Караткевіч, П.Я.Карпенка, Ф.А.Касько, Н.Л.Касяновіч, У.Г.Кобрын, А.Т.Корхава, Е.Дз.Косцік, Б.І.Кулінчык, Л.І.Лявонаў, А.А.Маскоўскі, А.І.Мялешка, Н.І.Ніканава, А.Ц.Новікаў, М.Ц.Пашкоў, Л.М.Пунтус, У.Т.Самалётаў, У.Ц.Самойленка, Н.М.Сарока, М.І.Сачыўка, М.К.Светлік, В.С.Свянціцкі, А.Т.Седукова, А.Ц.Сідарэнка, А.І.Сілаева, І.А.Сініла, У.А.Сцепчанка, А.Л.Трапкоў, А.П.Удавенкаў, П.Я.Уцянаў, Н.Я.Цімафеенкава, У.І.Шаблюк, Р.І.Шавякоў, К.І.Шаплыка, З.М.Шчэрбіч, Ф.А.Яроцкі, І.П.Яршоў. **1974**. І.Л.Асколкін, А.П.Бандарэнка, Дз.І.Бярозкін, М.В.Бялясаў, А.А.Гламазда, І.Д.Жаваранкаў, С.С.Сяліцкі, А.С.Осіпава, Я.Б.Фрыдлянд. **1975**. А.А.Акуловіч, У.А.Амельяновіч, М.З.Асмыковіч, А.Т.Ахрaменя, М.В.Баркевіч, Р.М.Басалыга, П.Р.Баярчук, С.І.Белавус, В.І.Бранавец, В.М.Будніцкая, К.П.Буснюк, М.М.Буцько, В.А.Валанцэвіч, П.Т.Валатковіч, І.А.Вараб'ёў, Г.Р.Васілеўскі, І.К.Вятушка, У.Дз.Гамеза, І.В.Ганчароў, Ф.А.Гармаш, І.І.Герасімаў, В.І.Грыдзюшка, А.В.Гурло, А.І.Дамарацкі, П.В.Дзяменцьеў, К.М.Дзям'янаў, Дз.М.Дзяржаўцаў, В.І.Жук, М.С.Жукоўскі, В.А.Зазноба, М.Д.Захараў, А.В.Змушко, І.П.Зуйкевіч, М.І.Іваноў, С.С.Каваленка, Я.М.Казлоў, М.П.Каланчук, С.Ф.Канавалаў, С.А.Карняевец, Р.Р.Касмін, І.І.Каян, А.А.Кніга, Л.П.Козел, Я.І.Козін, С.А.Комлеў, У.Ф.Коўзік, Д.А.Крыцук, К.А.Кузьміч, М.М.Купрацэвіч, Л.І.Курлючэнка, І.С.Лазовік, В.П.Лазука, Р.М.Ланец, І.Д.Лебедзеў, А.І.Ліс, К.В.Лукашэвіч, М.М.Лупееў, В.М.Лучкоўскі, У.Я. Максіменка, І.Т.Малаеў, В.А.Маненя, С.І.Мяжуеў, І.А.Панамар, А.В.Панок, А.І.Петрукевіч, А.Ф.Пілецкі, В.І.Пінчулін, С.С.Працько, С.П.Пыжык, І.П.Рай, І.У.Рудзько, В.С.Рудзіна, І.П.Рудніцкі, Ю.С.Рымковіч, М.В.Сапановіч, Д.І.Сапліцкі, Л.А.Сачыўка, І.А.Спадабаеў, І.С.Сурта, В.Л.Талочка, Ф.С.Трус, В.І.Урбановіч, І.Я.Хатэец, Р.М.Халам'еў, М.Н.Храменкаў, В.І.Цагельнік, С.Я.Целяпнёў, У.Я.Цыба, А.С.Чагін, У.Ц.Чарвякоўскі, М.М.Чаркесаў, В.С.Чарнякоў, А.В.Часнакоў, К.Ф.Чыркоў, М.С.Шумчык, Н.С.Шынкароў, Р.С.Якуш, М.К.Ярошаў. **1977** С.Т.Анісаў, В.Г.Анісенка, А.А.Архіпаўскі, М.Т.Арыстава, Л.С.Астаноўка, Я.В.Баранаў, К.Ф.Барысавец, М.П.Брацянкоў, З.І.Бычкова, Р.А.Варабей, Т.І.Галіца, У.С.Грынюк, І.М.Дайнека, М.І.Данілкаў, С.М.Жуковіч, М.У.Знак, В.С.Кадушкіна, Л.І.Казырын, А.Дз.Канаплянікаў, Г.М.Катляроў, Я.І.Кімстач, Ф.Я.Красінская, М.А.Крысіна, Д.І.Кудравец, І.І.Курзянкоў, А.В.Марцынкевіч, В.Р.Масюткін, М.М.Мельнік, В.С.Мілеўскі, К.П.Місюк, К.І.Пазняк, П.С.Палто, А.Ф.Рапецкая, Б.М.Сак, Л.В.Сакоўскі, І.П.Салёнаў, І.М.Саўко, В.А.Сідаровіч, Н.С.Скамарохава, В.І. Снапкова, Л.І.Сыса, А.К.Усава, Б.М.Фуніцкаў, А.М.Ходас, А.М Шаўчурка, А.П.Шуткін, А.П.Шыбека **1978**. А.Т.Анішчанка, Л.Ц.Батвінёнак, І.С.Гатоўскі, І.В.Грынашкевіч, А.М.Дудук, Б.М.Жураўль, М.Дз.Іванова, Г.К.Іваноў, Ф.Б.Ненартовіч, М.П.Пазднякова, А.А.Паташкін, У.П.Самсонаў, В.К.Старавойтаў, Л.Ф. Сычова, У.І.Урбан, Ф.І.Чэрнікаў. **1979**. В.С.Жданович, В.Ф.Карманаў, В.П.Махлай, А.В.Пятрова, І.І.Савенка, Р.А.Сініцына, У.Ф. Скрыцкі, М.К.Снегіроў, Л.І.Хітруи, В.П.Цімашэнка. **1980**. А.А.Валадзько, А.П.Жыбуль, М.П.Жыдаль, І.І.Лазарчук, І.Е.Мядзведзеў, Я.У.Рудэнка, У.М.Рэпкін, Л.І.Сарокіна. **1981**. А.С.Гераскін, Л.Я.Падымака, І.І.Сяргееў **1982**. М.К.Андрасюк, М.А.Германовіч, К.К.Кавалёва, Т.І.Капчонкава, В.І.Каравай, Н.К.Лапука, Г.Ц.Новікаў, А.А.Пакала, Р.С.Самцова, А.К.Халенкава. **1983**. Н.І.Барадаценка, М.Ф.Дзехцярова, К.А.Карабко, У.У.Конан, Я.Ф.Кульгавеня, Э.Я.Ляшнеўскі, Ф.У. Мірачыцкі, А.К.Петрушкевіч, М.І.Сідарэнка, Ф.А.Скудная, Н.В.Тарасевіч. **1984**. М.А.Магучы. **1985**. В.І.Арцюшэўская, Н.М.Бакун, Н.У.Бутрымовіч, А.М.Бухаўка, І.Я.Бяспалых, А.Я.Васільеў, А.К.Віцкоўскі, В.А.Галінская, П.І.Гамза, Ю.І.Гурыновіч, У.А.Давыдаў, І.К.Даніловіч, М.У.Жук, С.А.Жукоўская, П.А.Жушма, С.П.Зяневіч, Л.І.Кадлубовіч, Л.М.Казакова, Г.У.Казляк, М.М.Кандаулаў, В.М.Каравай, Я.П.Каспяровіч, У.М.Клімовіч, М.А. Кляпец, І.С.Ключынскі, А.Т.Кобрусеў, В.Я.Лапушынскі, А.В.Ляснічы, А.В. Майсевіч, С.М.Мурашкін, У.І.Мядзведзеў, Г.У.Налівайка, М.І.Ніканчык, М.П.Панасенка, У.І.Панкратаў, Н.А. Панцялеева, Н.А.Пархоменка, М.У.Раманчык, Г.І.Расолава, М.А.Рэмізанава,

К.С.Савановіч, М.П.Смаляк, Б.І.Тараканн, С.В.Тарасава, М.І.Уласік, Т.С.Федасенка, Т.А.Шаўчэнка, Р.К.Шпакаў, М.С.Шыракапыт, М.Л. Яркевіч. **1986**. І.С.Барыскін, В.У.Барысюк, А.М.Беза, Э.І.Бербаш, М.Дз.Варабей, І.І.Дзяміда, З.У.Дубінка, Я.М.Дудкевіч, Ю.І.Жураўская, В.Б.Жаўнова, А.Р.Зарэмскі, В.С.Кавалёва, Р.Я.Капчыкава, У.П.Кемежук, У.М.Коршунаў, Я.І.Кудзінаў, А.М.Ладзюкоў, Я.І.Лявіцкая, Ф.М.Мардухай, Ф.І.Маскаленка, Я.В.Машарскі, Н.А.Мельнікава, Л.П.Новік, Н.В. Паўлючкова, В.С.Прэнза, А.У.Пяхота, В.І.Развадоўскі, А.Ф.Раманюк, А.І.Русак, В.І.Савіцкі, М.В.Саленік, В.М.Сваток, Ф.А.Сякацкі, С.В.Трусевіч, І.Я.Харашкевіч, І.Г.Хільмановіч, Л.П.Цэд, Я.С.Чарняўская, Г.Р.Шантаровіч, М.Е. Шчарбіна, Л.А.Шыллоўская, В.К.Шынкевіч. **1987**. У.А.Баум, Дз.С.Ляшук, В.Я.Расянкова. **1988**. В.І.Бабушкіна, П.В.Галадко, Н.А.Гладышава, А.М.Зінкевіч, Т.В.Конан, М.М.Міндзюкевіч, Г.І.Няфёдава, Н.І.Сянчыла. **1989**. А.В.Караткевіч, В.М.Котаў, Ф.А.Наркевіч, В.А.Тарасюк, А.Л.Фрыдман. **1990**. У.А.Быкаў, Р.Р.Гарашчэня, Л.А.Дазорцаў, У.С.Кітаеў, Я.С.Ліўшыц, І.З.Майдзін, І.Ф.Новікаў, В.А.Папкоў, Э.А.Пятровіч, П.М.Шарснёў. **1991**. Р.П.Бараноўскі, І.В.Геведзе, А.П.Герасімаў, У.І.Дубоўскі, М.Н.Кананчук, М.Дз.Лянкевіч, Ч.І.Рынкевіч, М.І.Рэдказубаў, М.У.Саўчык, М.Ц.Славашэвіч, Ф.П.Цыганоў, А.А.Яроменка. **1992**. П.М.Бацяноўскі, З.Д.Гільман, П.С.Жукава, В.А.Матусевіч, І.І.Мікановіч, В.М.Шарэшык. **1993**. М.С.Герасімук, П.М.Заяц, Н.І.Мілановіч, А.І.Паўлоўскі, А.С.Скакун. **1994**. А.І.Антановіч, А.А.Багушэвіч, Л.І.Бярдзічавец, Г.І.Віяленцій, Я.М.Вырко, В.П.Груша, А.М.Жук, А.К.Захарэвіч, М.А.Канстанцінаў, М.А.Карчміт, М.А.Мароз, М.У.Нячаеў, М.С.Пронька, К.У.Рахатка, У.В.Савашынскі, М.Т.Смалянка, В.П.Яцкевіч. **1995**. В.С.Кашуй, К.К.Курыловіч, Л.П.Навуменка, І.І.Плаўскі, М.А.Расолька, У.І.Урбан, Б.М.Шапіра. **1996**. Я.А.Бухавецкі, І.А.Голуб, У.І.Крамко, Л.С.Майсееў, У.В.Рудзянок, У.Ч.Серахан, К.С.Шкраба. **1997**. С.У.Сабко, Дз.І.Самусік, Г.Ф.Скакун, Я.П.Разнічэнка.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК СФЕ́РЫ АБСЛУГО́ЎВАННЯ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным работнікам прадпрыемстваў, аб'яднанняў, устаноў, арг-цый, якія працуюць у розных сферах абслугоўвання насельніцтва 15 і больш гадоў, за заслугі ў аказанні насельніцтву гандл., быт., жыллёвых, камунальных і інш. паслуг, у распрацоўцы і ўкараненні новых відаў паслуг, новых форм і метадаў абслугоўвання, арганізацыі ўстойлівага і якаснага функцыянавання камунальнай гаспадаркі, сістэм водаачысткі і водазабеспячэння, службы ацяплення, асвятлення і захавання жылога фонду, расшырэнні і ўмацаванні матэрыяльна-тэхн. базы прадпрыемстваў, павышэнні ўзроўню падрыхтоўкі кадраў. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 6.5.1970 існавала званне засл. работнік быт. абслугоўвання насельніцтва БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі сферы абслугоўвання Рэспублікі Беларусь

1970. С.А.Адамовіч, А.У.Амбражэвіч, А.Ц.Астрэйка, Н.Ю.Балазюк, Г.У.Баранчук, І.П.Барысевіч, П.З.Баяроўскі, С.У.Бегер, С.А.Францэвіч, Л.У.Буцькова, В.М.Гутараў, Т.С.Дзедуль, К.С.Жылінскі, Н.П.Казлова, М.І.Камінскі, М.А.Клімкова, Е.Я.Лазарэтава, С.А.Лукашык, У.М.Лукашэвіч, Г.Ф.Макс, З.А.Мураўёва, М.А.Несцярэнка, В.Ф.Папоў, Р.С.Пілішкіна, Ш.Е.Сахадзе, В.Д.Сілко, У.І.Скарынка, М.М.Сокал, І.М.Старацітараў, Я.Р.Сцепанцоў, С.І.Сэй, П.К.Сямашка, У.М.Трус, І.У.Філіповіч, В.В.Хмялькова, А.С.Церабілаў, І.А.Цэдзік, Я.Р.Шалабанаў, С.Ф.Шыманко, В.С.Шышко, С.С.Ярошчык. **1974**. С.М.Барашкаў. **1975**. У.П.Кахро. **1976**. В.І.Зайцава, М.Б.Царова. **1977**. Л.М.Кляпацкая, Дз.З.Ларыёнаў, П.І.Папоў. **1978**. І.І.Казельскі, Н.С.Катлінская, У.П.Панасюк, А.М.Раеў. **1979**. А.Д.Арэхава, А.С.Бакулін, В.А.Карачун, Я.Я.Ліставенка, Т.С.Мышкоўская. **1980**. М.Р.Балашчанка, В.К.Бычык, А.І.Зенчанкаў, Р.П.Касьянюк, В.П.Лобач, А.А.Паўленкава, Э.Ф.Таўпянец, К.І.Хорава, В.П.Экстратаў. **1981**. В.М.Гладкі, І.П.Кароль, Л.К.Куіш, М.П.Федаровіч. **1982**. М.С.Вальвачоў, М.Ф.Маёраў, Э.П.Ражкоў, У.А.Шчасны, І.М.Шытохін. **1983**. Г.І.Зязюлевіч, М.С.Мурына, А.І.Хлус, Л.Ф.Шыян. **1985**. П.П.Якутаў. **1989**. Н.М.Нікалаева. **1990**. С.І.Брынкевіч, П.Д.Бурмістрава, А.І.Воранава. **1991**. М.Э.Фрыдлянд. **1993**. Я.Дз.Уласко. **1994**. М.І.Крук. **1996**. С.Н.Паўлянок, М.Р.Трус. **1997**. Б.В.Батура, Р.Ф.Рубекін.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК ТРА́НСПАРТУ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным работнікам чыг., паветр., воднага, аўтамаб., трубаправоднага і інш. відаў транспарту, якія працуюць у галіне транспарту 15 і больш гадоў, за заслугі ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці і паляпшэнні выкарыстання трансп. сродкаў, зніжэнні сабекошту перавозак, павышэнні якасці трансп. паслуг, эканоміі матэрыяльных і паліўных рэсурсаў, забеспячэнні бяспекі руху, аховы навакольнага асяроддзя. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 29.10.1971 існавала званне засл. работнік транспарту Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі транспарту Рэспублікі Беларусь

1971. А.В.Анфімаў, А.М.Арлоў, А.С.Арлоўскі, М.М.Белабровік, С.М.Бліннікаў, М.Ф.Букаў, У.І.Верамейчук, К.С.Жук, Г.Г.Іваноў, У.Р.Івановіч, К.С.Каваль, Ф.Ф.Каляка, М.К.Караулаў, А.В.Касай, В.С.Качарскі, А.В.Куценка, М.Н.Леўчык, А.В.Лук'янаў, Ф.А.Мацюшын, Я.Ц.Наталевіч, А.С.Пазняк, У.С.Палякоў, І.Я.Рабаконь, А.П.Трафімаў, М.Ф.Трафімаў, С.В.Тачылін, К.А.Філонаў, М.І.Хартава, С.А.Цітоў, А.Ф.Цюрыкава, І.М.Шавейка, М.А.Шалякін, Ф.М.Шарай, М.В.Швейкус, М.А.Якуш, К.М.Янкоўскі. **1972**. І.А.Дударчык, Ф.П.Клачок, І.А.Махвіц. **1973**. В.В.Анановіч, В.М.Залеская, Р.А.Карначоў, В.П.Філатаў. **1975**. М.З.Акаліта, У.А.Арэхаў, М.І.Асмалоўскі, Д.Ф.Байдах, Дз.С.Баранаў, А.С.Бачыла, Б.С.Белашкурка, В.В.Бондараў, Р.А.Буракоў, А.Р.Бут-Гусаім, Р.А.Вальчук, А.К.Варабей, М.І.Васілёнак, Я.М.Венядзіктаў, М.Р.Верамееў, У.Ф.Галісевіч, К.М.Гараўцоў, І.М.Гуркоў, І.Н.Даўжэнка, М.М.Жук, А.М.Зінкевіч, А.К.Зызнік, В.Я.Ільюшонак, У.С.Казлоў, В.У.Калядзін, П.Я.Канапацкі, М.І.Краснабаеў, М.М.Кучынскі, В.М.Лічман, С.І.Луцэвіч, М.П.Лявоненка, М.Н.Мазалеўскі, М.С.Мяленцьеў, М.М.Пархоменка, Дз.М.Рудзін, М.С.Рэзнікаў, Г.М.Сарокін, А.Ц.Собалеў, І.С.Цімашэнка, А.А.Шпакаў, І.М.Шуваеў, П.Ф.Юрчанка, Я.П.Юшкевіч. **1976**. І.І.Анкуда, П.М.Архіпаў, С.Ц.Архіпаў, І.А.Беластоцкі, Я.Г.Белякоў, П.М.Блізнюк, М.С.Ганецкі, І.В.Гаражанцаў, М.А.Гарбаценка, У.І.Гаўрылюк, Д.Р.Глушаненка, В.І.Грэсь, М.Р.Дзмітрыенка, Л.С.Дзямешка, Я.Ф.Зайцаў, В.К.Ількевіч, Н.І.Кавальчук, А.Р.Косікаў, У.С.Крамянецкі, А.А.Кузняцоў, Л.П.Кузняцоў, Я.П.Макарэвіч, С.Е.Мардачоў, А.А.Марцінік, М.В.Машчук, С.П.Медзін, І.М.Мельнікаў, Л.П.Пазнякоў, І.В.Патапаў, Я.Ф.Паўлоўскі, А.М.Піваварaў, А.І.Пустаход, А.Д.Пятроўскі, І.А.Рыбакоў, С.Я.Сачкоўскі, І.І.Сегенчук, А.Т.Сідараў, І.І.Сляпец, Р.І.Такуноў, А.А.Тарасевіч, К.І.Ткачэнка, В.А.Туркоў, Ц.У.Хахлоў, С.Д.Шабуневіч, І.В.Шыпіца, І.П.Яромін, Я.Ф.Яўсеенка. **1977**. Ю.П.Марозава, К.Р.Крывашчокі, Р.У.Пятроўскі, Ф.П.Шабалін. **1978**. Ю.Л.Афанасьеў, С.Е.Бераснёў, С.В.Валіцкі, В.І.Вільчынскі, В.К.Ельскі, П.Е.Каранчук, М.П.Кулік, А.Ф.Кушнер, І.А.Маркоўскі, В.Г.Мешчарук, М.В.Наканечны, М.Н.Платонаў, С.Я.Плотнікаў, А.Н.Рудзеня, Ю.А.Савельеў, С.В.Сіманенка, П.Д.Смялянскі, В.М.Сямёнаў, А.У.Храноўскі. **1979**. Г.І.Аўсянкін, В.Я.Баранаў, М.Л.Барздоў, Л.М.Белянкоў, М.І.Вайцюк, С.В.Жданоўіч, І.С.Жывуцкі, А.А.Жылко, А.М.Каляга, І.М.Кахценка, Б.Я.Класоўскі, Н.Г.Козел, І.Л.Мароз, В.С.Мікалуцкі, Г.І.Новікаў, Р.С.Падгайскі, Ф.А.Пятроў, І.І.Радчанка, Ф.І.Сабалеўскі, Т.Т.Сіпаты, В.М.Фёдараў, М.І.Чэрнак, Т.П.Шадура. **1980**. М.І.Аксёнчык, І.А.Артамонаў, І.І.Астапенка, А.А.Бохан, М.П.Брэнч, В.І.Бусел, М.Я.Гардзейчык, А.А.Грамовіч,

А.Л.Дружылоўскі, Дз.Р.Зубовіч, П.П.Зялінскі, Р.П.Кандрацюк, Б.А.Квіткоўскі, А.К.Кішчынскі, А.П.Кот, М.А.Кузьміцкі, Э.С.Лапцэвіч, А.С.Лях, А.С.Лящчынскі, М.А.Маліноўскі, М.Ф.Махначоў, М.А.Мініч, В.І.Місан, М.П.Молчан, В.У.Нарэйка, Р.А.Праскоў, І.М.Сапранкоў, А.І.Скармаховіч, А.В.Сцепічаў, М.А.Цыёлта, Л.Р.Шакун, Я.М.Штэфан. **1981**. М.Р.Барысаў, А.І.Заікін, П.Ф.Кавалеўскі, Р.Р.Казека, С.І.Камар, М.Г.Кучмін, В.П.Максімчук, Ю.І.Марынкевіч, А.П.Пархоменка, В.С.Пянькоўскі, А.В.Ступінскі. **1982**. В.С.Багдановіч, Т.К.Вяленчыц, А.І.Жданаў, А.М.Крэль, Дз.С.Сверкуноў. **1983**. А.Ф.Акімаў, М.П.Аўраменка, А.А.Дрозд, У.А.Казючыц, В.М.Сердзюкоў, М.А.Сямкоў, А.І.Харашылаў. **1984**. М.С.Каліта, П.В.Мітасаў, К.А.Хвайніцкі, І.С.Шчарбакоў. **1985**. М.І.Мінін, С.А.Плаксін, У.Т.Рабчанка, М.І.Шашкоў. **1986**. Л.Л.Бачыла, А.В.Бульба, У.І.Гапееў, В.П.Дзмітрыеў, В.А.Драздоў, У.К.Емяльянчык, І.П.Еўтуховіч, М.С.Заблоцкі, Г.А.Коктыш, М.А.Лобаў, М.М.Марчук, У.І.Піліпенка, В.А.Турчанка, М.Н.Юшкевіч. **1987**. К.М.Калеснік, В.В.Клачко, В.Д.Максімішын, Г.С.Мархутаў, У.І.Мацюнін, У.І.Шыдлоўскі. **1988**. У.К.Аўдашкаў, В.А.Бяневіч, А.Б.Дабжынецкі, А.А.Дземічаў, Э.А.Каспяровіч, С.Г.Сталярчук. **1989**. Г.Л.Альтшуль, Я.В.Башын, У.М.Вырабка, І.С.Гаргун, Я.Р.Грышукевіч, П.П.Кліменка, Л.М.Перхуноў, М.І.Салавей, С.І.Цярэшка, В.С.Штайда. **1990**. М.Т.Грыбоўскі, Л.Ц.Драчынская, І.І.Коўш. **1991**. Г.С.Барашка, М.А.Грынюк, Г.Г.Драбышэўскі, У.У.Малаш, Б.У.Мурашкевіч, Г.П.Панкратаў, А.І.Сарока. **1992**. Л.І.Бовін, Ю.М.Папоў, Ф.С.Ратковіч, А.М.Сяргееў. **1994**. В.П.Апарын, У.С.Грыб, З.І.Лучко. **1996**. В.І.Бураў, Я.І.Валадзько, М.Х.Крылоў, Г.І.Невяроўскі, У.К.Нікановіч, С.Р.Шылаў. **1997**. Л.Д.Юркевіч.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАБО́ТНІК ФІЗІ́ЧНАЙ КУЛЬТУ́РЫ І СПО́РТУ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца арганізатарам фізкультурнага руху, вучоным, работнікам калектываў фіз. культуры, фізкультурных арг-цый, навуч. устаноў, н.-д. ін-таў, якія працуюць у галіне фіз. выхавання і спорту 15 і больш гадоў, за заслугі ў развіцці фіз. культуры і спорту, у арганізацыйна-метадычнай, вучэбна-трэніровачнай, выхаваўчай, інж.-тэхн., навук.-пед. і гасп. дзейнасці, удасканаленні сістэмы фіз. выхавання насельніцтва, масавага спорту, спорту вышэйшых дасягненняў. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1967 існавала званне засл. дзеяч фіз. культуры БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя работнікі фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь

1968. І.Я.Будзько, М.І.Васільеў, В.Дз.Дзмітрыеў, І.В.Жыткоў, П.А.Злотнікаў, А.І.Кавалеўскі, Р.Р.Карпаў, К.А.Кулінковіч, К.П.Нікіткоў, С.М.Салавей. **1969**. А.В.Мядзведзь. **1971**. Г.М.Бокун, Л.П.Бокун, К.Дз.Вараўка, Р.С.Ваткін, А.А.Губанаў, Р.І.Клім, Р.І.Кныш, М.П.Крываносаў, В.І.Лівенцаў, А.У.Ніканчыкаў, М.Б.Паўлючэнкаў, Т.Р.Рэнель, В.М.Фефелаў. **1972**. П.В.Грыгор'еў. **1973**. З.Ф.Бальшакова, К.В.Ганестаў, Б.З.Зыкаў, М.Л.Іткіна. **1976**. У.Б.Гурны, П.Я.Зубрылін, У.Р.Кузаўлёў, С.І.Цімчанка. **1979**. Э.У.Асіеўскі, У.І.Барсук, А.Дз.Бялова, Л.С.Варановіч, Я.І.Жавялёў, Б.А.Кузьмінскі, П.У.Піляк, М.І.Русіноўскі, В.П.Сазановіч, Дз.І.Сізоў, В.П.Угрумаў, У.Е.Уласаў. **1980**. Я.К.Анкуда, М.С.Бялянка, Л.З.Галяціна, А.І.Паўлаў, Т.Дз.Самусенка. **1981**. С.П.Міpановіч. **1983**. С.Л.Партноў, А.А.Раманькоў, В.А.Сакалоў. **1984**. В.У.Арлоўскі, В.В.Маклакоў. **1987**. В.М.Кісялёў, Г.Б.Рабіль, В.Ф.Рыжанкоў. **1988**. І.А.Коршунаў, Г.Л.Крыленка, С.Л.Макаранка. **1991**. Л.Р.Гейштар. **1992**. І.П.Гуцько, А.М.Курловіч, У.М.Рыжанкоў, М.В.Шапялевіч, С.С.Шынкар. **1993**. Б.А.Грынь. **1994**. І.М.Жалязоўскі. **1995**. М.М.Аўсянік, М.М.Калацей. **1996**. Дз.М.Развянкоў. **1997**. Т.Л.Бурло.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РАЦЫЯНАЛІЗА́ТАР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца аўтарам рацыяналізатарскіх прапаноў, укараненне якіх унесла грунтоўны ўклад ва ўдасканаленне вытворчасці, у павышэнне прадукцыйнасці працы, паляпшэнне якасці прадукцыі, умоў працы і тэхнікі бяспекі, забеспячэнне н.-д. і навуч. працэсу, якія вядуць шматгадовую рацыяналізатарскую дзейнасць. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1959 існавала ганаровае званне засл. рацыяналізатар Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя рацыяналізатары Рэспублікі Беларусь

1960. Х.І.Гандэльман, Я.А.Грамыка, Р.С.Ермашкевіч, М.М.Жукаў, У.А.Забяжаеў, І.М.Зарэцкі, В.П.Зданкевіч, А.К.Іваноў, К.К.Крашчановіч, В.М.Пагадаеў, У.А.Паўлоўскі, Б.В.Растанін, У.П.Русак, В.Л.Сакалоў, Л.І.Свістун, У.Д.Свічкароў, В.М.Скляднеў, П.Р.Стацэнка, М.П.Тадыкін. **1963**. А.А.Барташэвіч, Р.С.Бражэнас, А.С.Пуставайтоўскі, Л.К.Скуратовіч, А.І.Шылкін. **1964**. В.А.Антонаў, М.Я.Афончанка, Р.М.Багдасараў, А.І.Вазновіч, І.Дз.Вярбіцкая, І.Р.Гаража, А.Я.Дзмітрыеў, І.М.Ермакоў, Р.К.Жолтак, У.В.Звіжоў, Р.М.Іваноў, М.П.Іхно, У.А.Казлоў, У.Ф.Касінскі, В.М.Корбут, В.І.Кушнарэнка, А.М.Мартыненка, М.З.Марціновіч, М.П.Марчанка, У.К.Масюкоў, Дз.І.Мечнік, П.Я.Прыцкер, Э.В.Радкевіч, А.Е.Смірноў, Р.Ш.Столін, Я.М.Сцяпанаў, У.А.Трайц, А.К.Трыгубовіч, А.А.Усаў, С.Р.Фарбер, Дз.С.Фролкін, І.К.Хіба, І.Н.Хібнік, А.І.Хлапіцкі, А.П.Шаўцоў, Н.І.Шофер. **1966**. М.Р.Грынкевіч, Л.І.Кумец-Кулеш, У.Р.Пекеліс, В.У.Пятрышчаў. **1967**. М.А.Ардо, І.А.Баранцэвіч, С.М.Барысавец, А.Л.Бераснёў, Л.Р.Біржакова, П.І.Бойка, Ю.Ф.Боткіна, Б.І.Брыч, П.В.Валавод, П.Г.Васілеўскі, Ф.С.Віцебская, Р.П.Гальперын, І.Л.Гапановіч, Я.П.Гееўскі, І.М.Гурэвіч, А.Р.Дзюндзін, П.А.Жураў, І.Ф.Казлоўскі, П.П.Какоткін, Р.А.Карвяк, У.М.Кошаль, У.А.Кузняцоў, І.Я.Лашкоў, В.М.Любецкая, П.М.Макараў, К.Р.Манахаў, Д.А.Марчанка, У.Р.Маскалёў, Н.Ф.Мелавацкая, М.М.Міско, М.Р.Папоў, С.Ф.Патапаў, І.С.Пацехін, Л.А.Раманоўскі, Э.Е.Сафроненка, С.К.Сівохін, П.А.Сматрыцкі, В.П.Спічэўская, А.А.Харашчо, А.Л.Цыркуноў, Г.А.Цярэшка, А.Б.Чыжэўскі, К.М.Чыстабаеў, І.М.Шамес. **1968**. В.Я.Авяр'янаў, Г.М.Анфінагенаў, М.М.Ахрамовіч, А.М.Бабенка, М.Г.Баканаў, В.М.Ванін, П.Ю.Васілюк, А.М.Выхота, А.Р.Данін, В.А.Зінькоўскі, М.Н.Коннікаў, А.М.Кунцэвіч, Ф.Л.Ліпатаў, А.М.Лысы, У.П.Маркоўскі, А.У.Навуменка, У.М.Пятроў, В.С.Раманенка, У.Г.Сягоднік, Я.Г.Сойка, М.П.Стома, І.С.Тараеў, Я.Ф.Туфлін, Я.М.Увядзенскі, К.В.Чаравухін, У.Т.Чуракоў, І.П.Шапавалаў, М.Я.Ягораў. **1970**. С.Я.Абросімава, В.К.Антонаў, М.І.Арашонак, Г.А.Асколкаў, В.А.Ганелес, В.К.Гаўрыленка, Я.Е.Грыгор'еў, Э.Л.Гузоўскі, М.К.Данільчук, У.А.Зяваліч, Ф.Л.Іскароў, Э.У.Іскроў, А.В.Калошын, Б.І.Крыніцкі, Б.В.Лазарчык, А.Ф.Папялкоўскі, В.В.Подух, А.А.Чайкоўскі, Ю.А.Шчарбакоў, Я.С.Юрчанка, А.М.Ярэшчанка. **1971**. А.С.Аляксееў, А.С.Васіленка, Ф.І.Гарбуноў, І.А.Гардзейчык, А.М.Гільдэнберг, А.А.Дзянсківіч, А.Ф.Жолаб, В.Ц.Залатароў, А.М.Зянько, М.М.Ільясевіч, Э.С.Казанецкі, М.П.Каменскі, К.С.Кулеш, М.А.Кучко, П.П.Маліноўскі, Н.І.Мікульскі, К.П.Пеканюк, М.А.Пракапеня, П.В.Рыбакоў, Л.А.Савіцкі, У.У.Савіч, С.Л.Салавейчык, В.С.Семярной, Л.М.Станкевіч, В.Ф.Суздалеў, Я.П.Сяліцкі, Я.С.Франчкоўскі, Г.П.Шулікаў, Дз.Ф.Ягораў. **1972**. Б.П.Міpановіч. **1973**. М.Я.Бароўскі, В.У.Грыгор'еў, В.М.Духанін, У.А.Мазура, М.А.Рабянок. **1975**. В.І.Аляксееў, У.І.Антонаў, М.В.Балыкіна, Дз.М.Барысенка, В.П.Вараб'ёў, М.С.Громаў, П.А.Дзешавіцын, У.М.Жукоўскі, Дз.Д.Заяц, В.Д.Кузьмін, Ф.А.Купалаў, В.А.Лычкоўскі, Ю.І.Мажаеў, М.М.Някрасаў, Л.І.Пятаповіч, І.Я.Саксонаў, В.В.Самохін, Я.В.Сацукевіч, Л.П.Тумас, Ф.А.Хацкевіч, В.М.Чарненка, В.І.Яронька. **1979**. Р.Х.Бабіеў, С.К.Бандарук, Л.І.Драмянкоў, Г.А.Жыраў, І.Дз.Забаўчык, В.П.Загуменкаў, Л.В.Касцючэнка, І.П.Кобрынец, В.С.Леган, М.М.Лягезін, А.А.Пузевіч, В.Т.Пуставойценка, А.А.Радзевіч, А.П.Шыян. **1981**. А.Ф.Выбарнаў, М.М.Гаўрылюк, Г.А.Караткевіч, А.І.Каткоўскі, В.В.Ку-

ляшоў, Дз.А.Куртоў, М.Т.Лінькоў, Г.П.Маскін, А.Л.Міронаў, Г.І.Нікалаенка, А.В.Рак, У.Р.Шавель, В.П.Шамрэеў, Г.М.Шарэйка. **1983**. В.І.Навумаў. **1987**. К.Н.Раткевіч. **1988**. Г.А.Буйноўскі, А.В.Гарадзецкі, В.І.Дзяркач, М.М.Дзятлаў, В.У.Каранкевіч, Р.Я.Лішанскі, М.І.Пажыдаеў, В.У.Стасюк, І.В.Цітоў, А.К.Чорная, І.Ц.Якімаў. **1989**. К.Т.Бяляк, Р.Л.Гарус, М.Ф.Гаўрылаў, У.М.Даніленка, В.Р.Латушка, М.К.Лухвіч, В.П.Мамчыц, С.Р.Марачкаў. **1990**. У.А.Альбіцкі, Л.П.Бараноўскі, А.А.Баркун, Л.І.Іофе, П.П.Лабкоў, У.А.Ламака, М.М.Маркевіч, А.М.Піменаў, Г.І.Сліжоў, У.М.Якубенка. **1991**. Л.М.Бурскі, А.І.Каваленка. **1992**. Б.А.Кусакін.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ РЫБАВО́Д БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным работнікам рыбнай гаспадаркі, н.-д. ін-таў і арг-цый рыбнай гаспадаркі, што бездакорна прапрацавалі па спецыяльнасці не менш за 10 гадоў, мелі вял. заслугі ў развіцці рыбнай гаспадаркі і актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 16.7.1979, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. У законе ад 13.4.1995 аб дзярж. узнагародах Рэспублікі Беларусь гэта званне не адноўлена.

Заслужаны рыбавод БССР

1980. В.Р.Рыбалка.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ СУВЯЗІ́СТ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокакваліфікаваным работнікам сувязі, якія працуюць у галіне сувязі 15 і больш гадоў, за заслугі ў развіцці і ўдасканаленні сродкаў сувязі, паляпшэнні абслугоўвання насельніцтва, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, распрацоўцы і ўкараненні прынцыпова новай высокаэфектыўнай тэхнікі і тэхналогіі. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 1965 існавала ганаровае званне засл. сувязіст Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя сувязісты Рэспублікі Беларусь

1966. Н.Н.Азнабаева, Л.М.Анейчык, П.В.Афанасьеў, М.В.Барсегян, М.Ф.Валенда, А.П.Ганчарык, М.І.Гушчынская, П.Ф.Должыкаў, М.Ф.Еўтухоўскі, Ф.І.Жывіца, У.М.Жыгмунт, І.А.Зракаў, І.М.Д.Кацаў, А.Ц.Кашчэнка, І.М.Кваша, Я.П.Кернажыцкі, А.І.Каржанеўскі, І.К. Маркаў, У.Т.Паслядовіч, А.П.Сіскоўіч, К.В.Фралоў, П.А.Шкліваліна, І.Е.Яначкін. **1967**. П.К.Аўсеп'ян, У.А.Булыбенка, Л.П.Заяш, М.П.Карэцкая, Л.У.Касцюшка, І.М.Лузгін, І.Х.Лу'е, І.Я.Мядзведзеў, Н.І.Няілаў, П.І.Несцераў, П.А.Савельеў, С.К.Сівокін, Г.Дз.Шацкі, Т.А.Янкоўская, А.С.Яўрэінаў. **1968**. І.С.Алейнікаў, З.В.Аляксеева, Я.К.Андрэева, Э.Б.Беланоіч, А.М.Быкава, В.М.Васільеў, М.А.Вожыкава, А.П.Вырвіг, Ф.І.Гуз, І.М.Кацоіч, С.І.Красненка, М.В.Маньковскі, К.А.Марцінкевіч, М.С.Панкоў, А.А.Пшанічнюк, М.А. Старасцін, А.П.Старыковіч, Р.Я.Уладысік, Г.В.Хіжынскі, М.М.Шалега, С.М. Юранаў. **1969**. П.П.Вальскі, Н.М.Загудаева, Б.П.Капарыха, Л.С.Нурыева, І.П.Фурманаў, Р.І.Хадасевіч, У.К.Харытонаў, Т.А.Хацкевіч. **1970**. М.І.Бондарава, Л.К.Галаванава, В.А.Гардзеева, М.Т.Дэхта, У.І.Ільюцік, А.П.Караў, Р.Р.Кастравая, В.Ц.Курачэнкава, С.А. Папковіч, М.А.Прымшыц, Г.Ф.Пшаслаўская, І.В.Сіроткін, М.С.Сянько, Р.М.Філатаў, У.І.Чарнуха. **1971**. М.В.Банькоўскі, К.У.Буйніцкая, Л.М. Горская, А.Я.Дзяжко, І.Я.Звераў, Ф.К.Ісаеў, Я.В.Кніга, У.В.Кунтыш, В.П.Максімовіч, Я.С.Малахаў, Я.А. Маркоўская, А.А.Мураўёў, А.Ф.Невар, М.М.Расоха. **1972**. А.Я.Баброва, А.У. Міцкевіч, М.В.Пярвушын, С.В.Падмазенка, В.І.Слабашэвіч, І.С.Шмялькоў, Н.Ф.Шпілеўскі. **1973**. В.І.Любецкі. **1975**. А.А.Бугаеў, Л.А.Гардзеева, М.І.Кацерыкова, В.Ф.Салаўёва, І.У. Доўнар, Л.Л.Падорскі, Б.С.Смірноў. **1976**. А.Ф.Бандарэнка, І.Я.Бразгоўка, І.М.Грыцук, В.В.Казак, В.М.Самадзелава. **1977**. М.Я.Андрэеў, Д.Я.Краўцоў, У.Е.Крайко, І.В.Лявонаў, Л.К.Цярновая, І.А.Хуртай. **1978**. А.А.Кашаль, Ц.А.Сакевіч. **1979**. Л.А.Задорын, М.І. Дылевіч, М.Ф.Шарыкава. **1980**. Ф.Ц.Анкудзінаў, В.Дз.Лапін, Н.Дз.Рашэтнікава, С.М.Сянькевіч. **1981**. А.Р. Герасімовіч, М.Я.Ермакоў, П.І.Івашэвіч, М.М.Кваша, Л.І.Малчанаў, С.К. Славін, М.М.Худакормаў, У.І.Яначкін. **1982**. М.П.Гірыловіч, Г.С.Ліхач, М.Т. Шкаруба, **1984**. Г.В. Клімянкоў. **1985**. С.К.Бурачэўская, М.Ц.Зыкаў, Э.І.Палеес. **1989**. Г.Э.Куланіна. **1991**. Г.Дз.Чубат. **1995**. Э.У.Галаўко. **1996**. А.Н.Лістапад. **1997**. У.І.Ганчарэнка.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ТРЭ́НЕР РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокакваліфікаваным трэнерам-выкладчыкам па спорце, у тл. тым, што працуюць са спартсменамі-інвалідамі не менш за 4 гады, за паспяховую вучэбна-трэніровачную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы выдатных спартсменаў і каманд; трэнерам нацыянальных (зборных) каманд Рэспублікі Беларусь, якія маюць стаж работы з гэтымі камандамі не менш за 4 гады, за падрыхтоўку і паспяховае выступленне гэтых каманд на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах, пяршынствах і Кубках свету і Еўропы; першым трэнерам спартсменаў, якія дасягнулі выдатных поспехаў на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах, пяршынствах і Кубках свету і Еўропы, і тым, што працуюць з гэтымі спартсменамі не менш за 2 гады, пачынаючы з вучэбна-трэніровачнага этапу; трэнерам спарт. школ і арг-цый, што раней прымалі непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы перададзеных у вышэйшае звяно спартсменаў, пры ўмове работы з імі не менш за 4 гады. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Заслужаныя трэнеры Рэспублікі Беларусь

1995. В.А.Няфёдаў, М.Б.Парахоўскі, Ю.М. Тарасюк.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ТЭХНО́ЛАГ БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася работнікам канструктарскіх і тэхнал. арг-цый, н.-д. устаноў, вытв. і навук.-вытв. аб'яднанняў і прадпрыемстваў за вял. ўклад у распрацоўку і ўкараненне прынцыпова новай высокаэфектыўнай тэхнікі, якая адпавядае па сваіх тэхн.-эканам. паказчыках айч. і сусв. узроўням. Устаноўлена 19.8.1985, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Скасавана 23.11.1988.

Заслужаны тэхнолаг Беларускай ССР

1986. В.Р. Хадзкевіч.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ЎРА́Ч РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным урачам, што працуюць па спецыяльнасці 15 і больш гадоў, за заслугі ў ахове здароўя насельніцтва, арганізацыі і аказанні лячэбна-прафілактычнай дапамогі з выкарыстаннем у рабоце сучасных дасягненняў мед. навукі і тэхнікі. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. У 1940—79 існавала ганаровае званне засл. ўрач Беларускай ССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя ўрачы Рэспублікі Беларусь

1941. М.Н.Анісімава, Б.А.Бароўскі, М.М.Глухоўскі, С.І.Гутман, І.П.Ермачэнка, Я.І.Іазефсон, С.Т.Ільін, М.І.Кавалёнак, Б.І.Каган, М.А.Карначэнка, В.П.Лапцейка, Р.С.Левін, І.А.Лур'е, Р.М.Манесзон-Любіна, Б.В.Рыскін, Х.С.Скалабан, А.А.Стальберг, Г.І.Татарская, М.А.Тунік, А.А.Ушакевіч, Б.А. Файнштэйн, П.Я.Церашкоў, А.П.Цярпугаў, Г.П.Шараварай, К.З. Швыркуноў. **1948**. І.І.Багдановіч, Р.Ю.Берлін, Т.В.Бірыч, М.І.Бобрык, П.П.Даўтолікаў, Н.М.Кавалёў, А.А.Караткевіч, П.Ц.Комаў, І.М.Літашэнка, С.С.Лукашэвіч, У.В.Марзон, М.С.Маскова, А.Я.Мітрашэнка, М.Ц.Пятроў, М.Б. Смольскі, І.М.Стальмашонак, І.М.Хмялеўскі, А.І.Шуба. **1949**. І.Г.Бабіцкі, І.Г.Бахановіч, Д.С.Віткін, А.І.Вольскі, А.Ф.Жаўрыд, М.І.Красоўскі, С.І.Ліяранцэвіч, М.Б.Майзель, А.С.Мікульскі, М.І.Намеснікаў, І.Е.Новаш, К.Дз. Паўлюкоў, А.Ф.Саламаха, І.М.Сафонаў, А.С.Сямёнаў, Л.А.Фігоўскі, І.М.Фінкевіч, Ф.А.Храпко, Л.А.Чарнышкова, Ф.Я.Шульц. **1956**. К.Ф.Градзіцкі, Г.В.Кот, Д.М.Кулік, І.С.Лягенчанка, У.Ю.Мірончык, Г.І.Нядбайлік, Я.Я. Сяркова, В.В.Шушкевіч, З.А.Шымкевіч. **1958**. А.А.Абановіч, М.А.Аляксеева, М.К.Арэшкава, І.І.Астапенка, С.П.Афоненкаў, В.А.Вараб'ёў, В.М.Гарыенка, І.А.Кажанкоў, Ф.Ф.Касуха, І.Г.Палящчук, А.І.Перлаў, М.Л.Плугатар, П.М.Радкевіч, Т.Е.Савіч, Л.А.Стахоўская, М.А.Сяркова, П.М.Хлус,

В.П.Шчогалева, Г.У.Якубоўскі. **1959**. І.Б.Аляшкевіч, М.М.Громава, А.Р.Заводчыкава, Н.В.Клікунец, А.М.Палыгаліна. **1960**. М.А.Азіміна, Н.М.Акімава, З.Г.Алікіна, В.Ф.Бабінцава, Е.Р.Брэус, А.Д.Бярговіна, Н.А.Вараб'ёва, Т.С.Гапеенка, П.Д.Гарбацэвіч, Н.К.Гарэнка, З.В.Грэчыкава, Н.П.Дабрыніна, Н.Я.Дзеравянка, А.Ф.Емяльяненка, Л.Ф.Жалахаўцова, Т.А.Ждановіч, М.А.Жыгар, С.А.Заблоцкая, Н.П.Залатарская, А.І.Іванова, М.В.Каваленка, В.Я.Каган, І.Ф.Каралёва, Н.Р.Катлоўская, Е.Р.Ківа, Л.Д.Корбут, Н.А.Корзан, Т.Я.Крывіцкая, Г.Л.Лаўрыненка, С.В.Лісоўская, А.Ф.Лойка, Г.Дз.Марчанкова, С.М.Мац, Л.А.Медраш, А.П.Меншыкава, Г.І.Меркушава, М.М.Мінайлава, В.П.Нікіфарава, З.Ф.Нікіціна, З.М.Пазняк, М.В.Папова, М.І.Пейсаховіч, В.М.Поляк, Н.М.Равяка, Е.І.Раманькова, Н.І.Рудзік, М.С.Сімановіч, Н.Л.Смірных, Н.С.Сняжко, К.М.Сянько, Т.Н.Фёдарава, А.А.Цвяткова, Л.А.Чарнуха, П.П.Шакалава, М.І.Шамко, З.Я.Шырын, Г.А.Юркаўцава, Т.І.Якаўлева, Г.М.Якубцынер, К.С.Янушкевіч, А.М.Ярошына. **1961**. В.І.Альшэўская, Н.Р.Афанасьева, Г.І.Багданава, І.В.Балычаў, Р.І.Бір, Ф.А.Брагінская, В.М.Варажэйкіна, Е.І.Віталёў, М.К.Гардон, І.К.Гарэльчык, Т.М.Гельман, Дз.Я.Гіркін, Н.А.Гуцько, А.М.Дамброўская, К.М.Дарашэнка, І.І.Дзядзюра, С.Г.Дулаеў, Е.С.Жукоўская, В.Дз.Жукоўскі, Р.П.Індзікт, Т.Н.Каваленка, У.Л.Каладоўскі, Т.Ф.Корпусава, А.Ф.Крывашчокі, М.Ц.Кудрын, А.Е.Курачкаў, М.В.Лапаткіна, Н.С.Лебедзь, Л.А.Магер, Ф.А.Марыніч, Ф.А.Марынкевіч, А.М.Маўшовіч, К.А.Мацапура, І.А.Мацвееў, М.М.Мілер, Б.К.Някрасаў, А.І.Паліенка, С.І.Прасноў, А.М.Русаковіч, Я.С.Сает, Г.А.Саўкова, М.Ю.Сіліч, Л.К.Сокалава, М.М.Спірыдонаў, В.А.Старасціна, Р.А.Сырнікаў, В.Дз.Тамілін, А.І.Тоўба, В.Р.Цішчанка, В.І.Цымбарэвіч, М.А.Цярэшчанка, Н.М.Шчацініна, Н.М.Ярмаловіч. **1963**. Ю.Г.Батура, Я.Я.Бонч-Асмалоўскі, Г.У.Бурдзін, І.М.Герасімовіч, В.П.Камароў, Л.П.Навалодскі, Р.А.Шапіра. **1964**. В.А.Александровіч, Я.А.Алесін, В.Ф.Арленка, А.Л.Вейнберг, Г.М.Віко, М.М.Герасіменка, І.У.Гранкоў, К.П.Грышанкова, А.Л.Дарасінскі, І.Л.Друян, І.Ю.Жалкоўскі, І.А.Інсараў, В.Л.Казлова, У.Н.Капусцянскі, І.Б.Кардаш, А.К.Касач, А.Ф.Клімава, Н.В.Красоўская-Чарнышова, К.Р.Круцько, М.Г.Кулін, К.М.Леанкова, П.Р.Любянкова, Р.І.Палей, М.В.Паўлавец, З.К.Русанава, Ф.С.Сальнікаў, Н.Я.Сямак, Я.Р.Сянюк, А.Дз.Удавенкаў, Р.Я.Цемахоў, В.В.Шырын. **1965**. Г.В.Адамава, В.М.Бяспалава, К.Я.Герасімава, В.Дз.Жукоўская, М.П.Казлоў, Д.Г.Б.Кантар, А.М.Кісялёва, Ф.А.Корбут, Г.М.Лебедзева, К.А.Ледаўскіх, Н.А.Нікалаенка, В.В.Папковіч, В.І.Паралова, П.С.Ржаўскі, П.А.Рудзік, К.В.Сабалеўская, А.І.Салаўёва, Е.І.Смірнова, М.П.Усевіч, М.Дз.Фёдарава, В.І.Хорава, К.П.Чэпік, П.В.Шатровіч, А.У.Шыдлоўская, І.У.Яршоў. **1966**. А.Ф.Апацёнак, В.Р.Бакурына, Р.В.Бараш, А.Ю.Беленькі, Р.А.Ганкіна, М.І.Герасімовіч, А.Р.Дзем'янкоў, С.У.Дзмітрыеў, М.У.Дзянісава, Г.Е.Дубіцкая, Н.М.Запясочная, М.І.Катовіч, М.А.Кнак, К.Ш.Кугель, М.П.Курчаў, І.Е.Кутасаў, Н.М.Макавец, Б.М.Мардвінаў, С.З.Меклер, Н.І.Наздра, Л.С.Пінчук, І.Л.Прудніка-ва, В.Ф.Пташнік, І.А.Радзецкі, І.І.Рамашка, Т.І.Русакова, Н.І.Сахарава, А.І.Сачак, Л.А.Светачава, Д.Ф.Скарапанава, Ф.В.Старавойтаў, Н.У.Стракалава, Н.І.Сцепаненка, У.М.Талкачоў, А.І.Фятняева, Г.А.Цгоеў, Дз.П.Шавялёў, І.М.Шапіра. **1967**. К.Л.Анішчанка, Л.Ф.Байцова, Н.М.Берабеня, А.А.Бокач, Дз.П.Бяляцкі, Л.В.Галенчык, Т.Ф.Гузава, Г.А.Гуць, Е.П.Драздова, В.П.Зянько, Дз.І.Каласоўскі, Е.Я.Кронава, Н.М.Кучынская, С.К.Лапацін, В.М.Матора, Л.І.Міхновіч, С.А.Мішакова, І.В.Нічыпарук, М.П.Падбярэзная, А.М.Пазняк, В.М.Прохарава, Е.А.Ржавуская, Н.У.Селіванчык, А.М.Сільдзіміра-ва, М.В.Трусава, М.І.Харын, В.П.Цімашкова, Р.Р.Чарнова, К.Р.Чарняўскі, Ф.М.Чмель, А.М.Шаўлягін, Г.У.Шаўлякова. **1968**. П.В.Аляксейчык, Г.Г.Аляхновіч, Г.П.Андрусевіч, А.Г.Антонаў, Л.М.Афоніна, А.М.Бакалаў, В.Ц.Бакун, А.К.Брагін, Г.Т.Буглак, Н.Дз.Букацкая, А.Ю.Букач, В.С.Былінская, Я.З.Бычкоўскі, А.Г.Бялевіч, Г.П.Валачковіч, В.Дз.Варанкова, Ю.І.Ваяводзін, В.М.Вейсенберг, Г.А.Векшына, Н.І.Вінаградава, В.А.Вяржбіцкая, Н.П.Галавана, М.А.Галубцоў, Г.С.Гарбацэвіч, В.А.Гаўрыленка, І.І.Голікаў, Г.І.Гроздзева, М.І.Громава, А.І.Гурскі, А.М.Дабрынін, В.І.Давыдоўская, К.Р.Дайнека, М.І.Дашкевіч, Н.Ф.Драгун, З.А.Дувакіна, В.Г.Дунке, А.І.Жаваранкаў, У.М.Ждан, Г.А.Забоеў, В.У.Забродскі, Дз.С.Ізмайловіч, У.С.Ілбоўнік, А.М.Кавалёва, А.М.Каешка, Г.Г.Казюра, А.П.Каласкоў, Н.Ф.Каленчыц, В.С.Калядка, М.А.Капцэвіч, Я.К.Карасёва, Г.М.Касцевіч, У.Ф.Клімаў, М.А.Коп-цюх, Я.П.Круглік, Г.І.Лабзова, Я.Ц.Лахмакоў, Н.С.Леках, С.А.Лемяшонак, Г.А.Лешукова, А.А.Ліпень, Б.М.Ліўшыц, Л.Ц.Ліцкевіч, П.П.Лукашэвіч, В.І.Ляшчынскі, А.І.Малаш, Ю.І.Марцішонак, З.Р.Міхалап, С.І.Міцкевіч, Я.Н.Мядзвецкі, М.Л.Мяснікова, Я.З.Найдзёнава, В.А.Некрашэвіч, В.Ц.Новікаў, А.А.Няверка, М.Ф.Панцэвіч, Ф.А.Паперная, В.В.Папова, А.І.Парульмяркулава, М.І.Паўлючук, Ф.Е.Плоткіна, Ю.А.Пшанічнікава, Л.Н.Рабец, В.А.Радзівонава, В.Г.Ражкова, Л.Г.Рукман, Р.А.Русак, П.Я.Рыжова, К.С.Рымша, І.М.Сабкевіч, Л.В.Савінкова, З.П.Савянкова, М.А.Саламаха, К.М.Самсонік, А.І.Саракавумаў, І.Г.Саркісян, К.Я.Саўчанка, А.П.Сідарава, М.М.Скрыган, В.А.Смалякоў, В.С.Спірыдонава, П.І.Станішэўскі, В.Б.Стараселец, Л.С.Суравіцкая, А.С.Сушко, А.Р.Сцяпанаў, М.В.Тарасік, С.С.Тарасік, А.Ц.Татарынаў, М.Г.Токар, Г.У.Толкач, А.А.Тшаскоўскі, М.Р.Умінская, Я.С.Урбановіч, Г.Л.Філімонава, Р.У.Фомчанка, Л.Х.Хасін, Л.С.Цімчанка, В.Л.Чарнуха, Н.А.Чахоўская, В.С.Чурылава, Я.С.Чыжыкаў, У.Г.Чэшык, В.У.Шавалдышава, Т.С.Шаткоўская, К.І.Юрчанка, М.Р.Якабсон, У.А.Януковіч, Я.Б.Яцкова. **1970**. Т.М.Алефірэнка, К.М.Анішчанка, А.Р.Арцюшэнка, Ф.А.Багдановіч, М.У.Барысевіч, А.І.Бондараў, А.А.Дзядзюля, Л.Ц.Дзянісава, Ф.І.Жукоўскі, Л.Я.Забаронак, М.І.Калач, Л.Д.Каржуева, Л.М.Каронік, В.В.Кірыльчык, А.Ф.Кічаў, Р.В.Куліч, Т.А.Леановіч, Ф.Ц.Малышаў, Т.А.Наско, В.І.Невядомскі, Г.Ц.Несцер, Т.Ц.Паддубная, І.А.Паторская, Н.М.Расалоўская, С.І.Самарцаеў, Н.А.Сільнова, Л.К.Тапальскова, М.А.Турко, К.Ф.Усольцаў, Н.І.Хадасоўская, М.А.Чыгір. **1971**. І.М.Акунёў, Р.Г.Аўсянікава, А.А.Барадзін, М.Р.Белы, А.І.Гурская, В.І.Дзем'яновіч, К.К.Забароўскі, М.І.Лягенчанка, П.Н.Мельнік. **1972**. З.М.Жукава, Н.М.Пляцешкава, Е.Н.Сяліцкая, Л.А.Эвальд. **1973**. Г.Ф.Лось. **1974**. Л.І.Бондар, І.Я.Каленчыц, В.І.Каляда, І.М.Касім, Дз.А.Крупень, А.І.Ласіцкі, В.П.Малы, Ю.М.Мурашоў, Л.І.Нікановіч, Я.М.Пратасеня, А.П.Пятрухін, А.Г.Раўкін, М.П.Роўба, В.А.Сайкоўская, В.П.Салаўёва, А.В.Скачко. **1975**. Г.А.Абухаў, У.А.Баранік, В.Дз.Бякоеў, М.І.Бяляўскі, М.М.Валошын, В.П.Вераксо, І.І.Гудовіч, М.Ф.Ермачэнка, А.М.Зайцаў, М.І.Ігнацік, К.В.Капралаў, Т.П.Клімава, С.А.Кудзялевіч, Ф.А.Макарэвіч, Ф.Л.Малочка, М.А.Мароз, С.Л.Матусевіч, В.М.Мешчаракова, В.М.Прохараў, А.І.Пятровіч, І.І.Рогач, З.А.Трафімава, С.Дз.Трухан, Н.І.Урублеўская, М.Я.Церахаў, А.П.Цюрына, М.П.Чарных. **1976**. Р.С.А.Аксельрод, Л.П.Барадзіна, К.І.Баховіч, Ф.Н.Грэчка, М.В.Дзятлава, А.Г.Захараў, Т.П.Кавалёва, В.І.Касмачоў, В.Дз.Конанаў, Г.Т.Краўчанка, В.М.Крукаў, Т.Ф.Крывіцкая, П.Н.Лагун, У.У.Ладышкін, М.М.Ляйкоўскі, В.С.Лубніна, Г.Л.Мазурава, І.І.Невяроўскі, З.М.Палівода, М.В.Патоцкі, П.Ф.Тупікаў, В.І.Хомчанка, Г.Г.Часнакова, В.П.Шабека, М.Я.Шутала, Дз.П.Шэнец, К.Г.Юрацкая, С.П.Эверсман. **1978**. Г.В.Арлова, В.М.Варэнікаў, А.А.Герасімовіч, П.М.Дземяшкевіч, Г.К.Дзенісоўскі, А.А.Дзятко, Л.І.Дзятко, Т.М.Дуброўская, Л.А.Дуброўскіх, Г.А.Зуб, А.А.Імшанецкі, М.П.Кавалёў, Т.У.Камар, В.Ф.Каравянская, Ф.С.Кузнечык, М.П.Лапета, А.Б.Лаўрыновіч, М.Б.Левін, М.П.Марынкевіч, К.Ф.Мядзюшка, М.Я.Піліповіч, Л.В.Рагажынская, Т.В.Рудакоўская, Г.Я.Сівіцкая, К.З.Сякерыч, У.Я.Ткачэнка, В.А.Трацяк, Ф.К.Урублеўская, Т.В.Фокіна, Г.М.Харавец, Л.П.Шэлег, М.П.Янкоўскі, М.С.Яромін. **1979**. М.М.Бірукова, В.В.Гарызонтаў, Г.І.Дзікавіцкі, А.С.Дзяркач, К.А.Жвалеўская, У.Г.Загашвілі, А.Ц.Кажэўнікава, М.І.Каляга, М.Я.Карэлін, Г.М.Клімовіч, Л.І.Макарэвіч, А.В.Манулік, Я.А.Маслакоў,

Н.А.Матусевіч, Л.В.Параскевіч, А.С.Сахарук, Я.М.Славенка, М.С.Трафімчык, М.Г.Эранасьян. **1980**. І.В.Дурэйка, Л.А.Емяльянаў, В.С.Казакоў, В.С.Кірылка, А.Г.Піўчанка, В.З.Родзін, Л.В.Самусевіч, У.І.Сёмуха, А.М.Усціновіч, А.А.Ярашэвіч. **1981**. А.А.Андрушкін, З.І.Балакірава, В.А.Вайтовіч, Л.В.Варонежцава, П.Дз.Васільеў, Л.Д.Гаўрык, Г.П.Дасюкевіч, В.Я.Дзяржыцкі, М.П.Дзяругіна, Г.Я.Зянько, Н.Ц.Кавалеўская, Л.С.Капскі, А.І.Кондрусеў, А.П.Лебедзеў, М.П.Райкова, І.С.Сандрас, Г.М.Сільвестрава, А.А.Хартонік, М.А.Ходзінскі, М.В.Шалявальнік, В.З.Юрчанка. **1982**. П.І.Берняк, І.С.Кудлач, А.М.Мізяк, С.К.Нямчанаў, К.П.Палулех, А.А.Ракіцянская, Г.А.Салагуб, А.М.Сівуха, Л.Р.Сінякова, Л.П.Сцяпанаў, С.Г.Турковіч, Т.Р.Харчанка, М.М.Хомчанка. **1983**. А.А.Гарабурда, Г.М.Крупень, З.І.Ліўшыц, М.Н.Турбан. **1984**. І.А.Шэін. **1985**. І.П.Саханькоў, Я.Р.Ярмолаў. **1986**. Г.С.Кузняцоў. **1987**. Я.Дз.Гаварухін, В.М.Дронаў, Р.М.Кардаш, А.М.Лазарэнка, У.Ф.Пад'елец, М.В.Рагуліна, А.І.Рубінская, Е.П.Ярмак. **1988**. Ю.Я.С.Дзеняшчук, Г.В.Пілі пенка. **1996**. А.Т.Зорка. **1997**. М.І.Батвінкоў, Я.П.Дзямідчык, А.П.Майстровіч, Дз.А.Маслакоў, В.П.Паляшчук, Э.К.Русакоў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ШАФЁР БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным шафёрам за працу па спецыяльнасці не менш як 15 гадоў і за вял. заслугі ва ўдасканаленні арганізацыі работы, эфектыўнае выкарыстанне тэхнікі і забеспячэнне безаварыйнай работы. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 21.10.1968, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. З 29.10.1971 прысвойвалася ганаровае званне засл. работнік транспарту Беларускай ССР, з 13.4.1995 — *заслужаны работнік транспарту Рэспублікі Беларусь*.

Заслужаныя шафёры Беларускай ССР
1968. К.Ф.Атрашэўскі, І.Л.Аўрамаў, В.І.Балашоў, К.Б.Васільеў, П.І.Дзяржаўцаў, М.А.Драч, У.Н.Казлоў, М.М.Кір'янцаў, Ф.М.Кліменцьеў, А.С.Кончыц, В.В.Крук, Дз.І.Куханаў, В.Д.Максімішын, Т.М.Мядзведскі, В.І. Петрык, Н.Я.Петрыкевіч, У.С.Піскун, Л.А.Расцішэўскі, Р.Я.Снытко, В.А.Сяліцкі, М.В.Трошкін, І.А.Уліцкі, У.А.Філіманюк, А.А.Храменкін, І.П.Цыбулька, В.А.Шэін. **1970**. У.Р.Азараў, У.Р.Багданаў, І.А.Белостоцкі, Р.М.Валюкевіч, Дз.І.Вярыга, М.П.Герасімовіч, І.І.Гулевіч, А.К.Гулееў, В.В.Дабрынеўскі, П.М.Драбышэўскі, І.Ц.Дрындрожык, В.Ц.Завядзееў, П.І.Зялёнка, А.І.Казакоў, П.С.Касінец, У.Д.Крывец, І.К.Ліпніцкі, В.В.Ліпскі, І.А.Малееў, П.М.Марозаў, П.К.Міхалёнкаў, М.І.Мурашка, Х.І.Муха, К.М.Нарановіч, Г.І.Нарышкін, М.П. Нікіфараў, Г.А.Палякоў, М.І.Плотнікаў, У.М.Пузына, М.М.Розін, В.Р.Рычаго, Ц.П.Сазонаў, М.І.Тхораў, Р.А.Хаўратовіч, С.П.Чайкоў, Ч.В.Часноўскі, А.С. Чуяшкоў, М.П.Шамшын, І.А.Шуба, А.В.Шыдлоўскі, К.П.Юда, В.П.Юзоніс, У.В.Якімовіч, С.С.Ясюкевіч.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ЭКАНАМІ́СТ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным эканамістам і фін. работнікам прадпрыемстваў, устаноў, арг-цый, органаў дзярж. улады і кіравання, якія працуюць па спецыяльнасці 15 і больш гадоў, за заслугі ў галіне эканомікі, дзярж. і фін. дзейнасці, у развіцці эканам. навукі, падрыхтоўцы кадраў. Устаноўлена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. З 6.11.1970 існавала званне засл. эканаміст БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.
Заслужаныя эканамісты Рэспублікі Беларусь
1971. Ф.З.Аблавацкі, М.І.Аксючыц, А.Ф.Аляксееў, А.А.Ганчарэнка, А.А. Глазянкоў, В.С.Гук, В.П.Дымовіч, К.І.Жмачынскі, Т.А.Зіміна, Л.М.Карзо, З.З.Клугман, Я.В.Кухавараика, В.В.Лапаціна, К.В.Локцева, М.А.Лугаўцоў, А.Дз.Лялін, Д.А.Лятвішка, А.І.Малахава, К.І.Маркоўская, В.П.Марчук, І.П.Маскалёў, В.Дз.Мінееў, Р.Л.Нескаромная, В.І.Новікаў, П.В.Памялова, Б.Е.Панурын, Т.М.Пятроў, В.Ф.Рамашкін, Н.А.Рашчакатаева, В.В.Саўчанкава, У.М.Скуратовіч, Н.С.Тандава, Н.В.Удавічэнка, А.І.Цітова, П.В.Цярэшка, А.М.Чубрык, В.І.Шувалава, П.М.Шэлег, М.П.Яцкоўскі. **1972**. С.Р.Аўсянікаў, В.С.Маўрышчаў. **1973**. Б.І.Баброў, К.І.Берднікава, Г.У.Брыкач, М.А.Гарбуз, У.І.Жыватчэня, Г.І.Зундаль, М.Р.Канавалаў, Т.П.Красоўская, У.Ф. Лузгін, М.І.Мікуліч, А.Ф.Міхалкевіч, В.М.Мягкая, Б.М.Розенблюм, В.М. Цалко, А.І.Цімошчанка, І.І.Яздзела, К.Ф.Якаўцава. **1974**. Н.П.Антонава, А.П.Гуносава, М.Я.Каган, Г.А.Прахарэнкава, Х.С.Хрышчановіч, А.А.Чыжоў, П.А.Юніцкі. **1975**. Г.С.Біскупскі, Ф.М.Бялкоў, Л.А.Горкая, С.А.Ліцвін, М.В.Паўлава, Л.М.Паўлючэнка, І.П. Плятнёва, Ю.С.Рэут, В.А.Сямыніна, К.М.Трыгубаў, А.І.Федаровіч. **1976**. М.Н.Альтшулер, В.А.Астапенка, І.С.Баркун, В.А.Канаш, А.М.Копач, Я.М.Махлін, П.Ф.Патапенка, М.П.Супінская, К.Х.Уладзімірская, Ц.Г.Хрыпач. **1977**. Л.М.Красільнікаў, В.С.Ляўчук, П.І.Шварцбург. **1978**. Л.М.Гірэйка, А.Р.Данілаў, Л.І.Каганская, М.Р.Казачонак, І.П.Калеснікава, П.Л.Коханаў, Н.Ф.Маркоўская, М.В.Мораў, А.М. Пшонка, І.М.Сімуткін, У.І.Страчук. **1979**. М.В.Адамовіч, Ф.М.Іваноў, Р.І.Малчанаў, А.І.Петухоў, Ф.І.Самоўк, Б.І.Шаціла. **1980**. І.І.Бабіч, П.Дз.Гаман, Н.П.Ганчарова, Ю.І.Гірба, І.С.Гушчык, І.Ф.Ермакоў, Н.С.Максімаў, У.М.Мураўскі, М.С.Сачко, В.А.Язерская. **1981**. А.А.Асокіна, Г.С.Барадулькіна, М.Дз. Гарбачоў, А.С.Дзякаў, Т.Ф.Кісель, М.М.Лапіцкая, Г.П.Лямцюгіна, Я.Р. Мерзаў, В.А.Нядзелька, Б.П.Палыгала, Т.А.Паўлоўская, Э.Л.Пацэвіч, А.Е.Стукач, З.І.Тарасенка, В.А.Трапашка. **1982**. Н.П.Бусько, Н.М.Бяляева, М.Л.Лебедзеў, Л.Ф.Лутохіна, В.А.Міхайлава, С.Г.Таўпялёў. **1983**. У.Ф.Барташ, В.І.Выбарнаў. **1984**. Г.П.Астроўскі. **1985**. Ф.А.Дронаў, С.П.Падабед, А.А.Папасёмаў. **1986**. В.М.Ажэгаў, Б.А.Дуко. **1988**. В.Дз.Жарыкаў, Л.П.Кулакоў. **1989**. Г.І.Жмакіна, В.П.Яцкевіч. **1990**. Л.Л.Ермаловіч, М.З.Фрэйдзін. **1991**. М.І.Ціхонка. **1994**. Р.М.Вячорка, Л.Р.Кандратаў, М.С.Куняўскі. **1995**. М.В.Айдарава, У.П.Кулакоў. **1996**. А.А.Коўшар, Л.П.Падгурскі. **1997**. Г.С.Алейнікаў, М.У.Амельяновіч, Н.П.Гайдучэнка, А.П.Дудкін, М.Р.Румас, М.С.Слесараў, В.Г.Шабека.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ЭНЕРГЕ́ТЫК БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойвалася высокакваліфікаваным рабочым вядучых прафесій, інж.-тэхн. работнікам электрастанцый і падстанцый, электрычных і цеплавых сетак, будаўніча-мантажных, наладачных і рамонтных арг-цый, н.-д. і праектных ін-таў за працу па спецыяльнасці не менш як 15 гадоў і за вял. заслугі ў развіцці і ўдасканаленні энергетыкі рэспублікі. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 24.12.1970, прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР. Існавала да 23.11.1988.
Заслужаныя энергетыкі Беларускай ССР
1971. А.Ф.Аляксеенкаў, П.А.Гамалюк, Г.Ф.Дзмітраковіч, В.Я.Ермачэнка, У.В.Іваноў, С.Ф.Ігнаценка, А.Д.Кантуш, І.В.Карабач, І.С.Лапаеў, Э.А.Лаўрыновіч, У.І.Марчанка, Л.Ф.Ніканораў, А.І.Рогаў, Г.У.Траяноўскі, С.Я.Чуеў, А.П.Юшкін, М.Б.Яфімец. **1974**. У.Дз.Аляксандраў. **1975**. І.М. Аляксандраў, М.І.Граблюк. **1976**. П.Я.Берасцень, П.Ц.Дашкоў, В.П.Кушняроў, А.П.Саўчук, Я.Я.Фёдараў, Л.А. Шота. **1978**. А.Р.Міньковіч, А.П.Хамчаноўскі, І.В.Юшкевіч. **1980**. М.С.Жураўлёў, Ю.Ю.Жылінскі, А.М.Леанкоў, Р.М.Матроскін, А.І.Сухоцкі, Я.Ф.Цымбарэвіч, І.І.Чыжонак. **1981**. Г.А.Лаўроў, С.М.Цыцура, Н.М.Шчыцына. **1984**. Ю.П.Казырэнка, В.П.Сіланцьеў, І.У. Юшкевіч. **1985**. С.А.Мухараў, В.П.Панкоў. **1986**. І.М.Акуліч, В.В.Герасімаў.

ЗАСЛУ́ЖАНЫ ЮРЫ́СТ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, ганаровае званне, якое прысвойваецца высокапрафесійным юрыстам, што бездакорна працуюць у органах дзярж. улады і кіравання, пракуратуры, суда, у адвакатуры, н.-д., навуч. установах, на прадпрыемствах, у аб'яднаннях, установах і арг-цыях па спецыяльнасці не менш за 15 гадоў і маюць вялікія заслугі ў забеспячэнні захавання законнасці і ўмацаванні правапарадку, абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян, фарміраванні прававой дзяржавы, развіцці юрыд. навук, падрыхтоўцы заканадаўчых актаў. Уведзена законам ад 13.4.1995, прысвойваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. У 1966—94 існавала ганаровае званне засл. юрыст БССР, якое прысвойвалася Прэзідыумам Вярх. Савета БССР.

Заслужаныя юрысты Рэспублікі Беларусь **1967**. І.З.Асінцоў, В.З.Барыскін, С.А. Бяссонаў, В.І.Верамянюк, С.Дз.Глазаў, М.С.Глазкоў, У.І.Дзерышаў, Н.В.Кавалёў, В.Ц.Калмыкоў, С.І.Камрукоў, Я.А.Коўган, П.К.Лузгін, І.А.Луцэвіч, М.А.Палавінка, С.Ф.Панін, М.М.Рабы, П.І.Рудзеня, Т.А.Суржэнка, М.П.Шугай. **1968**. А.Г.Бондар, П.І.Гарэлік, Я.П.Дзіжэнін, П.М.Захарошка, А.І.Карнач, І.М.Мазураў, У.М.Мельнікаў, С.М.Наследнікаў, А.Ф.Панісаў, В.А. Станцэль, Я.І.Стафановіч, З.Ф.Чавусава. **1971**. В.П.Барабаш, А.А.Кулінковіч, Л.У.Пралеска, Ф.М.Сядоў, П.К.Толар, В.С.Уркуноў, І.С.Цішкевіч, В.Ф.Чыгір. **1972**. Р.С.Бізюк, М.П.Буякоў, У.Ф.Быкаў, І.Дз.Ветраў, В.Л.Ганчароў, І.А.Капусцін, Т.Р.Клібанская, І.Р.Комлеў, Я.К.Руткоўскі, Б.М.Савачкін, М.Я.Хурсік. **1973**. У.Б.Гусарэвіч, І.З.Камароў, І.П.Пастрэвіч, А.В.Рахманаў. **1974**. І.М.Бялоў. **1975**. І.А.Алёшын, В.М.Балясаў, Н.І.Бахановіч, П.П.Германаў, П.Ф.Драбкоў, М.Дз.Зубар, Ф.А.Конышаў, А.Ф.Дучанок, І.П.Матарас, Т.П. Салаўёва, Б.І.Трацякоў, В.І.Філіпенка, А.П.Яфімаў. **1976**. В.М.Галаўнёў, У.А. Ганенчык, Л.Л.Дзядкоў, А.І.Карабанька, Г.С.Караджамірлінская, З.У.Каралёва, Г.І.Ладзік, А.С.Лепяшоха, Л.М.Мельнікаў, І.І.Нікіфараў, І.П.Сандрыгайла, Л.С.Спаткай, Г.М.Станкевіч, А.І.Тарасевіч, Р.І.Тачальны, І.В.Шыбанаў, А.І.Эйдлін. **1977**. В.А.Аўтушка, Э.А.Багдановіч, А.Р.Баранаў, Г.С.Белахвосцік, М.А.Габралёў, У.І.Дзіканаў, Р.І.Іваноў, У.П.Іваноў, В.І.Івахнюк, Р.І.Кротаў, М.П.Лапыка, В.Р.Максімаў, Н.Я.Пабрызгаева, Н.В.Паспелава, М.І.Радашкевіч, А.С.Салынскі, С.М.Федарчук, У.Т.Чэрнік, Я.С.Ягорава, Я.В.Якімовіч. **1978**. Я.Я.Бурдзевіцкі, Н.А.Кудзінаў, А.М.Фамін. **1979**. А.Я.Праксенка, А.А. Смактуновіч, Ф.А.Сурганаў. **1981**. Л.А.Дашук, В.Р.Дзямідовіч, М.М.Зянькчук, М.Я.Кашкоў, Я.І.Кісялёў, І.Я. Крот, І.З.Кульчынскі, Г.І.Курганская, Ф.Я.Латыш, В.І.Літвінаў, А.Н.Ніжнікаў, В.С.Палькін, Я.М.Парахаўнічэнка, М.І.Праўдзін, В.П.Сямёнаў, В.У.Чканікава, Ф.А.Шаева. **1982**. У.С.Анціпаровіч, М.У.Арэшанка, М.М.Камінскі, П.З.Лабус, М.К.Лёгкі, Л.Я.Любіч, Ц.Дз.Скакуноў. **1989**. Г.А.Скапцова, І.І.Сухаверх, Л.П.Цярэшчанка. **1990**. А.М.Агароднік, Я.К.Аземша, А.А.Галаўко, Т.І.Кастраміна, Л.А.Козырава, А.П.Палавінка, К.П.Панцэвіч, А.А.Салдаценка, В.Г.Ціхіня. **1991**. Н.П.Нічыпарэнка, І.П.Сашчэка. **1992**. М.М.Вараб'ёў, Л.І.Гарбаленя, У.Л.Гораш, В.В.Падгруша, С.У.Скаруліс. **1994**. І.П.Аленчык, С.В.Барыка, У.В.Бойка, Дз.П.Булахаў, М.У.Валкавец, Р.А.Васілевіч, М.І.Грыб, В.С.Камянкоў, Н.А. Краўчук, Т.М.Лінник, П.А.Лісоўскі, У.В.Нячаеў, М.І.Пастухоў, В.А.Піскароў, А.М.Смаленцаў, В.М.Чарноў, В.І.Шаладонаў. **1995**. І.І.Басецкі, З.А. Варабей, І.І.Марціновіч, А.А.Нічыпаровіч, В.А.Фадзееў, А.У.Харытановіч. **1996**. С.Р.Драбязка, У.С.Каравай, Э.Ф. Мічыліс, М.Р.Юркевіч. **1997**. В.А.Коршунава, Р.Р.Маркоўскі.

ЗАСНАВА́ЛЬНІЦКАЯ А́КЦЫЯ, від *акцый*, якія размяркоўваюцца сярод заснавальнікаў акц. кампаній і даюць ім пэўныя правы і прывілеі ў параўнанні з інш. акцыянерамі. Да такіх пераваг адносяцца, напр. павышаныя *дывідэнды*, дадатковая колькасць галасоў на агульных сходах акцыянераў, права на першачарговае атрыманне акцый пры дадатковым іх выпуску, на атрыманне часткі *заснавальніцкага прыбытку*.

ЗАСНАВА́ЛЬНІЦКІ ПРЫБЫ́ТАК, даход, які атрымліваюць заснавальнікі *акцыянернага таварыства* пры яго арг-цыі і эмісіі акцый. Складае розніцу паміж сумай, атрыманай ад рэалізацыі акцый гэтага т-ва, і ўкладзеным у яго капіталам. З.п. узнікае або за кошт продажу акцый вышэй іх намінальнай вартасці, або за кошт павелічэння аб'ёму продажу акцый звыш устаноўленага акц. капіталу.

ЗАСНАВА́ЛЬНІЦКІЯ ЗАТРА́ТЫ, расходы прадпрымальніка, звязаныя з заснаваннем і арганізацыяй прадпрыемства, набыццём асн. сродкаў для яго функцыянавання. Уключаюць расходы на заснаванне, рэгістрацыю кампаніі (атрыманне ліцэнзіі, расходы на падпіску і размеркаванне каштоўных папер, адкрыццё рахунку) і «першасныя» затраты, г. зн. расходы, неабходныя для таго, каб пачаць работу прадпрыемства (рэклама, маркетынгавыя даследаванні); расходы на павелічэнне акц. капіталу — на эмісію аблігацый, прэміі па аблігацыях, набыццё нерухомасці. З.з. павінны быць пакрыты ў як мага больш кароткі тэрмін, яны не ўлічваюцца як актывы кампаніі і не прымаюцца ў разлік пры яе ліквідацыі.

ЗАСНАВА́ЛЬНІЦТВА, дзейнасць па стварэнні новых арг-цый, акц. кампаній, т-ваў і інш. Гл. таксама *Грундэрства*.

ЗАСО́ЎЕЎСКІ СКАРБ, манетны скарб, знойдзены ў 1974 у в. Засоўе Лагойскага р-на. Схаваны не пазней 1608. Складаўся з 741 сярэбранай, 8 залатых і 5 фальшывых манет. Асн. частка З.с. — трохграшовікі часоў Стафана Баторыя (61 экз.), трохграшовікі (598) і шасціграшовікі (31) Жыгімонта III Вазы. У скарбе былі контрамаркіраваныя паўталеры Іспаніі Карла I і Філіпа II, манеты герцагства Браўншвейг-Вольфенбютэль, Венгрыі, Германскай імперыі, Іспаніі, Іспанскіх Нідэрландаў, эрцгерцагства Карынтыя, герцагства Курляндыя, курфюрства Саксоніі, Злучаных правінцый, герцагства Цешын, княства Трансільванія, Чэхіі, Турцыі. Скарб зберагаецца ў Нумізматычным кабінеце БДУ.

І.Н.Колабава.

ЗА́СПА, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Рэчыца—Лоеў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 14 км на Пд ад горада і чыг. ст. Рэчыца, 46 км ад Гомеля. 1440 ж., 550 двароў (1997). Крухмальны з-д. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Мураваная царква (1995). Курган Славы.

ЗАСПІ́ЦКІ Андрэй Міхайлавіч (н. 16.2.1924, г. Мазовец, Польшча), бел. скульптар. Засл. дз. маст. Беларусі (1977). Вучыўся ў Ін-це жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе (1940—41). Стварыў партрэты Цёткі (А.Пашкевіч; 1957), Ф.Шапэна (1960); бюст А.Міцкевіча (1995), станковыя творы «У полі» (1958), «Гімнасткі» (1971), кампазіцыі «Партызан-падрыўнік» (1957), «Дружба» (1964), «Рэквіем» (1996); і інш. Яго манум. творам характэрны дакладныя суадносіны маштабаў і масы, узбагачаныя кантрастамі святлаценяў, выразным лінейным рытмам: помнікі Ф.Скарыну ў Полацку (1973; па эскізу А.К.Глебава), Я.Купалу ў Мінску (1972; з А.Анікейчыкам і Л.Гумілеўскім; Дзярж. прэмія Беларусі 1974), у гонар вызвалення Віцебска (1989; з М.Рыжанковым) ў Віцебску, манумент у гонар маці-патрыёткі (Дзярж. прэмія СССР 1977), мемар. знак у памяць ахвяр фашызму ў Стоўбцах (1992) і інш. *В.Я.Буйвал.*

А.Заспіцкі. Цётка (А.Пашкевіч). 1957.

ЗАСТА́ВА, 1) падраздзяленне, якое выконвае задачы аховы. Вылучаецца войскамі на маршы (паходная З.), пры размяшчэнні на месцы (вартавая З.). 2) Падраздзяленне (каманда) пагранічнай вартавой службы ў Расіі 16—19 ст. Пазней — пагранічная З. 3) Месца ўезду ў горад або выезду з яго ў 16—19 ст., якое ахоўвалася вартай, дзе правяраліся дакументы і збіралася пошліна. У пач. 20 ст. некат. назвы З. замацаваліся за гар. ўскраінамі, напр., Нарвенская З. ў Санкт-Пецярбургу, Рагожская З. ў Маскве і інш.

СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ», ЯКІЯ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 6-га ТОМА БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

Галоўная рэдакцыя

Галоўны рэдактар — Г.П.Пашкоў; першы намеснік галоўнага рэдактара доктар гістарычных навук П.Ц.Петрыкаў; намеснік галоўнага рэдактара В.Ц.Осіпаў, намеснік галоўнага рэдактара Г.А.Фатыхава; намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар А.К.Фядосаў.

Навукова-галіновыя і кантрольныя рэдакцыі

Рэдакцыя гісторыі Беларусі

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук Л.У.Языковіч; вядучыя навуковыя рэдактары кандыдат гістарычных навук В.С.Пазднякоў, А.В.Скарахад; навуковыя рэдактары Ю.В.Бажэнаў, В.В.Гусева, Т.Г.Кляўко, М.І.Рэменіца, Дз.М.Чаркасаў.

Рэдакцыя ўсеагульнай гісторыі

Заг. рэдакцыі — З.І.Малейка; вядучыя навуковыя рэдактары Л.М.Драбовіч, У.Я.Калаткоў; навуковыя рэдактары Н.А.Дзянісава, М.Г.Нікіцін, Н.П.Ракіцкая.

Рэдакцыя філасофіі, эканомікі і права

Заг. рэдакцыі — кандыдат філасофскіх навук С.Ф.Дубянецкі; вядучыя навуковыя рэдактары В.В.Краснова, Г.А.Маслыка; навуковыя рэдактары Т.М.Грынько, М.У.Маркевіч; рэдактар В.В.Філіпава.

Рэдакцыя літаратуры і мастацтва

Заг. рэдакцыі — Л.В.Календа; вядучыя навуковыя рэдактары кандыдат філалагічных навук І.У.Саламевіч, Л.А.Сівалобчык; навуковыя рэдактары І.С.Александровіч, Н.В.Грэская, Г.І.Дайлідава, Т.Я.Жэбіт, Т.Р.Мартыненка, С.У.Пешын, Т.В.Пешына, А.С.Сідарэвіч.

Рэдакцыя біялогіі, медыцыны і сельскай гаспадаркі

Заг. рэдакцыі — кандыдат біялагічных навук Л.В.Кірыленка; вядучы навуковы рэдактар кандыдат біялагічных навук А.Г.Купцова; навуковыя рэдактары Т.І.Малашэвіч, В.А.Пазняк; рэдактар А.С.Бельская.

Рэдакцыя геаграфічных навук

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук В.П.Кісель; вядучы навуковы рэдактар І.Я.Афнагель; навуковыя рэдактары Л.В.Лоўчая, кандыдат геолага-мінералагічных навук Р.Р.Паўлавец, А.А.Трухан.

Рэдакцыя фізіка-матэматычных і тэхнічных навук

Заг. рэдакцыі — кандыдат фізіка-матэматычных навук А.І.Болсун; вядучы навуковы рэдактар У.М.Сацута; навуковыя рэдактары П.С.Габец, А.П.Чарнякова, Л.М.Шахлевіч.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук І.П.Хаўратовіч; вядучыя навуковыя рэдактары В.В.Гетаў, Е.П.Фешчанка; навуковыя рэдактары Г.Т.Глушчанка, І.У.Косціна, Н.К.Мазоўка, Г.М.Малей, М.А.Маўзон, Т.І.Нішт, Т.П.Панчанка, М.В.Пятроўская, Л.А.Суднік, А.А.Федасеева.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў

Заг. рэдакцыі — А.М.Хількевіч; вядучыя навуковыя рэдактары Н.В.Барай, В.У.Мінько; навуковыя рэдактары В.М.Вераценнікава, Я.У.Круглоў, Т.В.Шабунько.

Група картаграфіі

Вядучы навуковы рэдактар Г.Р.Шыкунова; навуковы рэдактар В.Ф.Надзененка.

Група тэхнічных рэдактараў

М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель.

Рэдакцыя фотаздымкаў і фотаілюстрацый

Заг. рэдакцыі — Г.М.Бажанкоў; фотакарэспандэнты А.П.Дрыбас, В.У.Харчанка; інжынеры-тэхнолагі С.А.Жукавень, І.У.Каваленка.

Рэдакцыя камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў

Заг. рэдакцыі — С.А.Макаёнак; інжынеры Г.А.Гурбо, І.М.Кузьмянкова; аператары С.А.Быткоўская, І.У.Грыцэль, А.У.Гурыновіч.

Вытворчы аддзел

Заг. аддзела — Т.Р.Рыбакова; інжынеры-тэхнолагі Т.М.Грыцышын, А.М.Красавіна.

Карэктарская

Заг. карэктарскай — А.М.Барысава; ст. карэктары Л.С.Зіза, А.В.Семенчукова, Т.П.Шыпінская; карэктар Т.С.Сівянок.

Навуковая бібліятэка

Заг. бібліятэкі — Г.А.Краўчанка.

Машынапіснае бюро

Г.Л.Анісімава, Т.Л.Барысоўская, Т.М.Саленік.

Агульны аддзел

Заг. аддзела — ст. інспектар па кадрах Т.А.Кароткіна; навуковыя рэдактары Р.Р.Блашко, Л.М.Шастакова; спецыяліст Ю.В.Бярэзіна.

Аддзел бухгалтарскага ўліку

Галоўны бухгалтар — С.У.Чахута; нам. галоўнага бухгалтара В.І.Плотнікава; бухгалтары Н.У.Дайлідава, С.А.Парфёнава, Н.Н.Статкевіч, А.У.Токарава.

Планава-эканамічны аддзел

Заг. аддзела — Т.Я.Буракова; вядучы эканаміст Т.І.Лук'янава.

Аддзел маркетынгу і аператыўнай паліграфіі

Заг. аддзела — М.К.Раткевіч; С.А.Акружко, А.І.Барнёва, Ю.В.Ждановіч, М.Ф.Пачэпка.

Участак размнажальнай тэхнікі

Ст. аператар капіравальных і множыльных машын Ф.А.Юркевіч; пераплётчыца Я.М.Кузьміна.

Гаспадарчы аддзел

Заг. аддзела — І.А.Шор.

Заўважаныя недакладнасці і памылкі друку ў 1—5 тамах БелЭн

Старонка	Слупок	Радок	Надрукавана	Трэба чытаць
			У 1-м томе	
111	сярэдні	28—29 зверху	**Адкры́тыя і закры́тыя мностваў**	**Адкры́тыя і замкну́тыя мностваў**
146	левы	24 знізу	маі—крас. 1945	маі—кастр. 1945
192	сярэдні	17—18 знізу	A.c. Na++I, Cl-I.	A.c. Na+1, Cl-1.
203	сярэдні	12 знізу	«З думай славяніна»	«З душой славяніна»
225	левы	19 знізу	Карбонская Галія	Нарбонская Галія
295	левы	26 зверху	Прынца Уэльска	Прынца Уэльскага
300	левы	8 знізу	алеуты на п-ве	алеуты на Алеуцкіх а-вах
326	правы	31—32 зверху	Расійскай Федэрацыі, Манголіі, КНР	Расійскай Федэрацыі, КНР
351	левы	35 знізу	кванэа	кванза
360	левы	15—16 зверху	У 1838 заснаваў...	У 1888 заснаваў...
362	сярэдні	3—4 зверху	Паўн. Амерыкі	Паўд. Амерыкі
367	правы	20 знізу	Аніён, гл.	Аніён, гл *Іоны.*
382	правы	28 знізу	пл. зледзянення... 2044 тыс. км^2	пл. зледзянення каля 12 000 тыс. км^2
33	сярэдні	6 зверху	селіцкімі плямёнамі	семіцкімі плямёнамі
202	правы	7 знізу	н. 9.12.1927	н. 9.12.1937
237	сярэдні	11 знізу	ніжэй (балалаечная)	вышэй (балалаечная)
352	правы	4 зверху	Сан-хан	Саін-хан
			У 3-м томе	
240	сярэдні	10 знізу	7.5.1883	7.5.1833
304	левы	18 зверху	Магілёўскі ун-т	Маскоўскі ун-т
370	левы	8 зверху	шыіцкіх храмаў	шываіцкіх храмаў
446	сярэдні	12 зверху	Ю.А.Балашоў.	Ю.А.Блашкоў.
			У 4-м томе	
75	левы	19 зверху	В. — чл. ААН (з 1995),	В. — чл. ААН (з 1955),
184	сярэдні	31 зверху	CH_3 COOCH—CH_2	$CH_3COOCH=CH_2$
192	правы	35 знізу	ў г. Кармар	ў г. Кальмар
234	сярэдні	1 знізу	А.А.Федарук	А.А.Федарчук
334	левы	29 зверху	18.9.1922	18.9.1992
419	сярэдні	18 знізу	г. Ітэрбюн	с. Ітэрбю
436	сярэдні	1 знізу	Стэла («Вольны вецер» Ю.Мілюціна),	Стэла («Вольны вецер» І.Дунаеўскага), Чаніта («Пацалунак Чаніты» Ю.Мілюціна),
			У 5-м томе	
8	правы	1 знізу	$E_f=E_i=E_k$	$E_f=E_i-E_k$
35	сярэдні	10 знізу	антычных	аптычных
50	правы	7 знізу	(30.1.1883)	(30.1.1833)
111	правы	1 знізу	Акрыцце Мадагаскара	Адкрыцце Мадагаскара
137	правы	21 знізу	8313 кг/м^3	831,3 кг/м^3
139	правы	18—19 зверху	магіторынгу	маніторынгу
271	левы	11 зверху	М.І.Цыбульскі	М.Л.Цыбульскі
282	сярэдні	4 зверху	С.Ф.Салавей	Л.Ф.Салавей
285	сярэдні	15 зверху	рэдактар Рас. акадэміі	рэктар Рас. акадэміі
287	левы	34 зверху	3.3.767	3.3.1767
352	правы	32 знізу	ў 7—6 ст. да н.э.	ў 7—6 тыс. да н.э.
363	правы	12 знізу	(ледавік Федчанкі, даўж. 77 м)	(ледавік Федчанкі, даўж. 77 км)
371	правы	2 знізу	рознага дэкору	разнога дэкору
456	правы	27 знізу	автоматических	ароматических
561	сярэдні	13 знізу	даведнік	даверніk

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 6: Дадаізм — Застава / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 1998. — 576 с.: іл.

Б 43

ISBN 985-11-0106-0 (т. 6)
ISBN 985-11-0035-8

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 6

ДАДАІЗМ — ЗАСТАВА

У томе змешчаны 1068 ілюстрацый, у т.л. 249 партрэтаў, 42 карты

Мастацкае афармленне *Э.Э.Жакевіча, А.М.Хількевіча*

Мастацкія рэдактары: *Н.В.Барай, Я.У.Круглоў, В.У.Мінько, Т.В.Шабунька*

Тэхнічныя рэдактары: *М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель*

Карэктары: *А.М.Барысава, Л.С.Зіза, А.В.Семенчукова, Т.С.Сівянок, Т.П.Шыпінская*

Падпісана да друку 24.04.98. Фармат 84×108 1/16. Гарнітура Таймс. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 60,48. Ум. фарб.-адб. 245,28. Ул.-выд. арк. 106,81. Тыраж 10 000 экз. Заказ 228.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 31.12.97. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета на Мінскай фабрыцы каляровага друку. Рэспубліка Беларусь. 220024, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.